Біблія (пераклад А.Бокуна)

The Holy Bible in Belarusan, Antoni Boken translation

Біблія (пераклад А.Бокуна)
The Holy Bible in Belarusan, Antoni Boken translation
Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016-2023 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Біблія (пераклад А.Бокуна)
This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:
You include the above copyright and source information.
You do not use this work for commercial purposes.
Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents.
For other uses, please contact the respective copyright owners.

2025-05-09

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 13 Jun 2025 from source files dated 9 May 2025
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc

Contents

БЫЦЬЦЁ . . . 1
ВЫХАД . . . 54
ЛЯВІТ . . . 98
ЛІКІ . . . 130
ДРУГАЗАКОНЬНЕ . . . 174
ЕГОШУА . . . 211
СУДЗЬДЗЯЎ . . . 236
РУТ . . . 260
1 САМУЭЛЯ . . . 264
2 САМУЭЛЯ . . . 297
1 ВАЛАДАРОЎ . . . 324
2 ВАЛАДАРОЎ . . . 356
1 ЛЕТАПІСАЎ . . . 386
2 ЛЕТАПІСАЎ . . . 415
ЭЗРА . . . 449
НЭЭМІЯ . . . 460
ЭСТЭР . . . 475
ЁЎ . . . 483
ПСАЛЬМЫ . . . 510
ПРЫПОВЕСЬЦІ . . . 579
ЭКЛЕЗІЯСТ . . . 601
ПЕСЬНЯ . . . 609
ІСАЯ . . . 613
ЯРЭМІЯ . . . 663
ПЛАЧ . . . 719
ЭЗЭКІЭЛЬ . . . 724
ДАНІІЛ . . . 776
ОСІЯ . . . 792
ЁЭЛЬ . . . 800
АМОС . . . 803
АБАДЫЯ . . . 809
ЁНА . . . 810
МІХЕЙ . . . 812
НАВУМ . . . 817
АБАКУМ . . . 819
САФОНІЯ . . . 822
АГЕЙ . . . 825
ЗАХАРЫЯ . . . 827
МАЛАХІЯ . . . 836
МАЦЬВЕЯ . . . 839
МАРКА . . . 873
ЛУКІ . . . 894
ЯНА . . . 930
ДЗЕІ . . . 957
РЫМЛЯНАЎ . . . 991
1 КАРЫНЬЦЯНАЎ . . . 1005
2 КАРЫНЬЦЯНАЎ . . . 1019
ГАЛЯТАЎ . . . 1028
ЭФЭСЦАЎ . . . 1033

ФІЛІПЯНАЎ 1038
КАЛАСЯНАЎ 1042
1 ТЭСАЛОНЦАЎ 1046
2 ТЭСАЛОНЦАЎ 1049
1 ЦІМАФЕЯ 1051
2 ЦІМАФЕЯ 1055
ЦІТА 1058
ФІЛІМОНА 1060
ГЕБРАЯЎ 1061
ЯКУБА 1071
1 ПЯТРА 1075
2 ПЯТРА 1079
1 ЯНА 1082
2 ЯНА 1086
3 ЯНА 1087
ЮДЫ 1088
АДКРЫЦЬЦЁ 1089

КНІГА БЫЦЬЦЯ

1 На пачатку стварыў Бог неба і зямлю.
2 І зямля была бязладная і пустая, і цемра над бяздоньнямі, і Дух Божы ўзносіўся над водамі.
3 І сказаў Бог: «Няхай станецца сьвятло». І сталася сьвятло.
4 І бачыў Бог сьвятло, што яно добрае, і разьдзяліў Бог сьвятло і цемру.
5 І назваў Бог сьвятло днём, а цемру — ноччу. І быў вечар, і была раніца — дзень адзін.
6 І сказаў Бог: «Няхай станецца прасьцяг сярод водаў і няхай аддзеліць воды ад водаў».
7 І зрабіў Бог прасьцяг, і разьдзяліў воды, якія былі пад прасьцягам, і воды, якія былі над прасьцягам. І сталася так.
8 І назваў Бог прасьцяг небам. І быў вечар, і была раніца — дзень другі.
9 І сказаў Бог: «Няхай зьбяруцца воды, якія пад небам, у адно месца, і няхай зьявіцца сухазем'е». І сталася так.
10 І назваў Бог сухазем'е зямлёю, а збор водаў назваў морам. І бачыў Бог, што [гэта] добра.
11 І сказаў Бог: «Няхай зазелянее зямля зелянінай, травой, якая сее насеньне, і дрэвамі пладовымі, якія даюць плады паводле гатунку свайго і маюць у сабе насеньне на зямлі». І сталася так.
12 І выдала зямля зеляніну, траву, якая сее насеньне паводле гатунку свайго, і дрэвы, якія даюць плады і маюць у сабе насеньне паводле гатунку свайго. І бачыў Бог, што [гэта] добра.
13 І быў вечар, і была раніца — дзень трэці.
14 І сказаў Бог: «Няхай стануцца сьвяцілы на прасьцягу неба, каб разьдзяляць дзень і ноч, і няхай будуць дзеля знакаў, і вызначаных часоў, і дзён, і гадоў.
15 І няхай будуць сьвяціламі на прасьцягу неба, каб сьвяцілі на зямлю». І сталася так.
16 І зрабіў Бог два сьвяцілы вялікія: сьвяціла большае, каб кіравала днём, і сьвяціла меншае, каб кіравала ноччу, і зоркі.
17 І зьмясьціў іх Бог на прасьцягу неба, каб сьвяцілі на зямлю,
18 і кіравалі днём і ноччу, і аддзялялі сьвятло ад цемры. І бачыў Бог, што [гэта] добра.
19 І быў вечар, і была раніца — дзень чацьвёрты.
20 І сказаў Бог: «Няхай узварушацца воды рухам душы жывой, і птушкі няхай лётаюць над зямлёю па прасьцягу неба».
21 І стварыў Бог цмокаў вялікіх і ўсякую душу жывую, якая рухаецца, якімі ўзварушыліся воды, паводле гатункаў сваіх, і ўсякую птушку крылатую паводле гатунку свайго. І бачыў Бог, што [гэта] добра.
22 І дабраславіў іх Бог, кажучы: «Пладзіцеся і множцеся, і напаўняйце воды мораў, а птушкі няхай множацца на зямлі».
23 І быў вечар, і была раніца — дзень пяты.
24 І сказаў Бог: «Няхай выдасьць зямля душу жывую паводле гатунку свайго: скаціну, паўзуноў і зьвяроў зямных паводле гатункаў сваіх». І сталася так.
25 І зрабіў Бог зьвяроў зямных паводле гатункаў сваіх, і скаціну паводле гатунку свайго, і ўсякіх паўзуноў зямных паводле гатункаў сваіх. І бачыў Бог, што [гэта] добра.
26 І сказаў Бог: «Зробім чалавека на вобраз Наш, як падабенства Нашае, і няхай ён мае ўладу над рыбамі марскімі і над птушкамі паднебнымі, і над скацінай, і над усёй зямлёй, і над усякім паўзуном, які поўзае па зямлі».
27 І стварыў Бог чалавека на вобраз Свой, на вобраз Божы стварыў яго, мужчыну і жанчыну стварыў іх.
28 І дабраславіў іх Бог, і сказаў ім Бог: «Пладзіцеся і множцеся, і напаўняйце зямлю, і падпарадкоўвайце яе сабе, і мейце ўладу над рыбамі марскімі, і над птушкамі паднебнымі, і над усякім зьверам, які рухаецца па зямлі».

29 І сказаў Бог: «Вось, Я даў вам усякую траву, якая сее насеньне, якая на абліччы ўсёй зямлі,
і ўсякія дрэвы, якія маюць плод дрэва і сеюць насеньне, каб былі вам на ежу.
30 І ўсім зьвярам зямным, і ўсім птушкам паднебным, і ўсяму, што рухаецца па зямлі, у якім
ёсьць душа жывая, Я даў усякую траву зялёную на ежу». І сталася так.
31 І бачыў Бог усё, што зрабіў, і вось, усё вельмі добра. І быў вечар, і была раніца — дзень шосты.

Бц 2

1 І былі скончаны неба і зямля, і ўсё войска іхняе.
2 І скончыў Бог у сёмы дзень працу Сваю, якую зрабіў, і супачыў у сёмы дзень ад усёй працы
Сваёй, якую зрабіў.
3 І дабраславіў Бог дзень сёмы, і асьвяціў яго, бо ў ім супачыў ад усёй працы Сваёй, калі ствараў
Бог, робячы.
4 Такі вось радавод неба і зямлі, калі былі яны створаныя, у дзень, калі ГОСПАД Бог зрабіў
зямлю і неба.
5 І не было яшчэ ніводнага куста палявога на зямлі, і ніводная трава палявая яшчэ не вырасла,
бо ГОСПАД Бог не спаслаў дождж на зямлю і не было чалавека, каб абрабляць зямлю.
6 І пара падымалася ад зямлі, і напойвала ўсё аблічча зямлі.
7 І зьляпіў ГОСПАД Бог чалавека з пылу зямлі, і ўдыхнуў у ноздры ягоныя дыханьне жыцьця, і
стаўся чалавек душою жывою.
8 І пасадзіў ГОСПАД Бог сад у Эдэме, на ўсходзе, і зьмясьціў там чалавека, якога зьляпіў.
9 І вырасьціў ГОСПАД Бог з зямлі ўсякае дрэва, прыгожае на выгляд і добрае на ежу, і дрэва
жыцьця ў сярэдзіне саду, і дрэва спазнаньня дабра і зла.
10 І рака выцякала з Эдэму, каб напойваць сад, і адтуль яна разьдзялялася на чатыры галоўныя
[ракі].
11 Назва адной — Пішон, яна атачае ўсю зямлю Хавіля, у якой золата.
12 А золата той зямлі добрае, там бдалях і камень онікс.
13 А назва другой ракі — Гіхон, яна атачае ўсю зямлю Куш.
14 А назва трэцяй ракі — Хідэкель, яна цячэ на ўсход Асірыі; а чацьвёртая рака — Эўфрат.
15 І ўзяў ГОСПАД Бог чалавека, і зьмясьціў яго ў садзе Эдэм, каб абрабляў яго і захоўваў яго.
16 І загадаў ГОСПАД Бог чалавеку, кажучы: «З кожнага дрэва ў садзе будзеш есьці,
17 але з дрэва спазнаньня дабра і зла ня еш з яго, бо ў дзень, у які будзеш есьці з яго, сьмерцю
памрэш».
18 І сказаў ГОСПАД Бог: «Ня добра быць чалавеку аднаму; зраблю яму дапамогу, адпаведную
яму».
19 І зьляпіў ГОСПАД Бог з зямлі ўсіх зьвяроў палявых і ўсіх птушак паднебных, і прывёў да
чалавека, каб пабачыць, як ён назаве іх, і як чалавек назаве кожную душу жывую, такое і імя
ёй.
20 І назваў чалавек імёны ўсёй скаціны, і ўсіх птушак паднебных, і ўсіх зьвяроў палявых, але
для чалавека не знайшлося дапамогі, адпаведнай яму.
21 І спусьціў ГОСПАД Бог моцны сон на чалавека, і [той] заснуў. І ўзяў Ён адно з рэбраў ягоных,
і закрыў целам тое месца.
22 І збудаваў ГОСПАД Бог з рабра, якое ўзяў з чалавека, жанчыну, і прывёў яе да чалавека.
23 І сказаў чалавек: «Вось, на гэты раз, гэта костка з костак маіх і цела з цела майго. Яна будзе
называцца жанчынаю, бо ўзятая з мужа».
24 Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці сваю і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць адным
целам.
25 І былі абое голыя, чалавек і жонка ягоная, і не саромеліся.

Бц 3

1 А зьмей быў хітрэйшы за ўсіх зьвяроў палявых, якіх зрабіў ГОСПАД Бог. І сказаў ён жанчыне:
«Ці ж гэта сказаў Бог: “Ня ешце з кожнага дрэва ў садзе”?»

2 І сказала жанчына зьмею: «Плады дрэваў саду можам есьці,
3 але пра плады дрэва, якое пасярод саду, сказаў Бог: “Ня ешце з яго і не дакранайцеся да яго,
каб вы не памерлі”».
4 І сказаў зьмей жанчыне: «Не памрацё сьмерцю!
5 Бо ведае Бог, што ў дзень, калі зьясьцё з яго, расплюшчацца вочы вашыя і станецеся як Бог,
тымі, хто спазнае дабро і зло».
6 І ўбачыла жанчына, што дрэва добрае для ежы, і прывабнае для вачэй, і пажаданае дрэва
дзеля разуменьня, і ўзяла яна плод ягоны, і ела, і дала мужу свайму, які [быў] з ёю, і ён еў.
7 І расплюшчыліся вочы ў іх абодвух, і спазналі, што яны голыя, і сплялі лісты фігавыя, і зрабілі
сабе перапаяскі.
8 І пачулі яны голас ГОСПАДА Бога, Які хадзіў у садзе ў ветры дня, і схаваліся чалавек і жонка
ягоная ад аблічча ГОСПАДА Бога сярод дрэваў саду.
9 І паклікаў ГОСПАД Бог чалавека, і сказаў яму: «Дзе ты?»
10 І той сказаў: «Голас Твой я пачуў у садзе і спалохаўся, бо я — голы, і схаваўся».
11 І сказаў [Бог]: «Хто распавёў табе, што ты голы? Ці ня еў ты з дрэва, з якога Я загадаў табе
ня есьці?»
12 І сказаў чалавек: «Жанчына, якую Ты даў, [каб была] са мною, яна дала мне з дрэва, і я еў».
13 І сказаў ГОСПАД Бог жанчыне: «Што ты гэта зрабіла?» І сказала жанчына: «Зьмей падмануў
мяне, і я ела».
14 І сказаў ГОСПАД Бог зьмею: «За тое, што ты зрабіў гэта, пракляты ты між усёй скаціны і ўсіх
зьвяроў палявых! На жываце сваім поўзаць будзеш і будзеш пыл есьці ў-ва ўсе дні жыцьця
твайго.
15 І Я кладу варожасьць паміж табой і жанчынай, паміж насеньнем тваім і насеньнем яе. Яно
скрышыць табе галаву, а ты скрышыш яму пяту».
16 А жанчыне сказаў: «Памнажаючы, памножу мучэньні твае і цяжарнасьці твае, з болем
будзеш нараджаць сыноў; і да мужа твайго памкненьне тваё, а ён будзе панаваць над табою».
17 А Адаму сказаў: «За тое, што ты паслухаўся голасу жонкі тваёй і еў з дрэва, пра якое Я
загадаў табе, кажучы: “Ня еш з яго”, праклятая зямля з-за цябе. У мучэньнях будзеш есьці
з яе ў-ва ўсе дні жыцьця твайго.
18 Церні і асот будзе радзіць яна табе, і будзеш есьці траву палявую.
19 У поце аблічча твайго будзеш есьці хлеб, аж пакуль ня вернешся ў зямлю, бо з яе ты ўзяты,
бо пыл ты і ў пыл вернешся».
20 І назваў чалавек імя сваёй жонцы — Ева, бо яна была маці ўсіх, што жывуць.
21 І зрабіў ГОСПАД Бог Адаму і жонцы ягонай адзеньне са скуры, і апрануў іх.
22 І сказаў ГОСПАД Бог: «Вось, чалавек стаўся як адзін з Нас, спазнаўшы дабро і зло. І цяпер
няхай ня выцягне ён рукі сваёй і ня возьме таксама з дрэва жыцьця, і ня зьесьць, і ня будзе
жыць вечна».
23 І выслаў яго ГОСПАД Бог з саду Эдэм, каб абрабляў зямлю, з якой быў узяты.
24 І выгнаў чалавека, і паставіў на ўсходзе ад саду Эдэм херувімаў і меч палымяны, які
паварочваецца наўкола, каб сьцерагчы шлях да дрэва жыцьця.

Бц 4

1 І чалавек спазнаў Еву, жонку сваю, і яна зачала, і нарадзіла Каіна, і сказала: «Атрымала я
мужа ад ГОСПАДА».
2 І яшчэ нарадзіла брата ягонага Абэля. І быў Абэль пастухом авечак, а Каін быў земляробам.
3 І сталася, калі прайшлі дні, Каін прынёс з пладоў зямлі дар ГОСПАДУ.
4 І Абэль таксама прынёс з першародных авечак сваіх і з тлустасьці іх. І ўзглянуў ГОСПАД на
Абэля і на дар ягоны,
5 а на Каіна і на дар ягоны ня ўзглянуў. І вельмі загневаўся Каін, і пахілілася аблічча яго.
6 І сказаў ГОСПАД Каіну: «Чаму ты загневаўся і чаму пахілілася аблічча тваё?

7 Ці ж ты не ўзьнімаеш [аблічча], калі робіш добра, а калі ня робіш добра, грэх ляжыць пры
дзьвярах, да цябе памкненьне ягонае, але ты павінен панаваць над ім».
8 І сказаў Каін Абэлю, брату свайму: [«Пойдзем у поле»]. І сталася, калі былі яны ў полі,
паўстаў Каін на Абэля, брата свайго, і забіў яго.
9 І сказаў ГОСПАД Каіну: «Дзе Абэль, брат твой?» А той сказаў: «Ня ведаю. Ці ж я вартаўнік
брата майго?»
10 І сказаў [Бог]: «Што ты зрабіў? Голас крыві брата твайго кліча да Мяне ад зямлі.
11 І цяпер пракляты ты ад зямлі, якая адчыніла вусны свае прыняць кроў брата твайго з рукі
тваёй.
12 Калі будзеш абрабляць зямлю, яна ня будзе больш даваць табе сілы свае. Выгнанцам і
ўцекачом будзеш на зямлі».
13 І сказаў Каін ГОСПАДУ: «Большае беззаконьне маё, чым можна зьнесьці.
14 Вось, Ты выганяеш мяне сёньня з аблічча зямлі, і буду хавацца ад аблічча Твайго, і буду я
выгнанцам і ўцекачом на зямлі, і станецца, што кожны, хто сустрэне мяне, заб'е мяне».
15 І сказаў яму ГОСПАД: «Таму кожнаму, хто заб'е Каіна, сем разоў будзе адпомшчана». І
пазначыў ГОСПАД Каіна знакам, каб не забіў яго кожны, хто сустрэне яго.
16 І адыйшоў Каін ад аблічча ГОСПАДА, і пасяліўся ў зямлі Нод, на ўсход ад Эдэму.
17 І спазнаў Каін жонку сваю, і яна зачала, і нарадзіла Эноха. І пабудаваў ён горад, і назваў імя
горада ад імя сына свайго — Энох.
18 І нарадзіў Энох Ірада, а Ірад нарадзіў Мэхіяэля, а Мэхіяэль нарадзіў Мэтушаэля, а Мэтушаэль
нарадзіў Лямэха.
19 І ўзяў сабе Лямэх дзьве жонкі. Імя адной — Ада, а імя другой — Цыля.
20 І нарадзіла Ада Яваля, ён быў бацька тых, што жывуць у намётах і маюць статкі.
21 А імя брата ягонага — Юваль, ён быў бацька ўсіх, што граюць на гусьлях і жалейцы.
22 І Цыля таксама нарадзіла Туваль-Каіна, які быў кавалём усякіх прыладаў з медзі і жалеза. А
сястра Туваль-Каіна — Наама.
23 І сказаў Лямэх жонкам сваім: «Ада і Цыля, паслухайце голас мой! Жонкі Лямэха, прыхіліце
вуха да мовы маёй! Бо забіў я чалавека за рану сваю і юнака за скалечаньне сваё.
24 Бо за Каіна будзе адпомшчана сем разоў, а за Лямэха — семдзясят сем».
25 І спазнаў яшчэ Адам жонку сваю, і яна нарадзіла сына, і назвала імя ягонае Сэт, бо [казала]:
«Даў мне Бог іншае насеньне замест Абэля, якога забіў Каін».
26 У Сэта таксама нарадзіўся сын, і ён назваў імя ягонае Энос. Тады пачалі клікаць імя
ГОСПАДА.

Бц 5

1 Вось кніга радаводу Адама. У дзень, калі Бог стварыў Адама, зрабіў яго на падабенства Божае,
2 мужчыну і жанчыну стварыў іх, і дабраславіў іх, і назваў іх імя "чалавек" у дзень стварэньня
іх.
3 І жыў Адам сто трыццаць гадоў, і нарадзіў [сына] на падабенства сваё, як вобраз свой, і назваў
імя яго Сэт.
4 І было дзён Адама па нараджэньні Сэта васемсот гадоў, і нарадзіў ён сыноў і дачок.
5 І былі ўсе дні Адама, якія ён жыў, дзевяцьсот трыццаць гадоў, і ён памёр.
6 І жыў Сэт сто пяць гадоў, і нарадзіў Эноса.
7 І жыў Сэт па нараджэньні Эноса васемсот сем гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
8 І былі ўсе дні Сэта дзевяцьсот дванаццаць гадоў, і ён памёр.
9 І жыў Энос дзевяноста гадоў, і нарадзіў Кейнана.
10 І жыў Энос па нараджэньні Кейнана васемсот пятнаццаць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
11 І былі ўсе дні Эноса дзевяцьсот пяць гадоў, і ён памёр.
12 І жыў Кейнан семдзясят гадоў, і нарадзіў Магалялеэля.
13 І жыў Кейнан па нараджэньні Магалялеэля васемсот сорак гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
14 І былі ўсе дні Кейнана дзевяцьсот дзесяць гадоў, і ён памёр.

15 І жыў Магалялеэль шэсьцьдзясят пяць гадоў, і нарадзіў Ярэда.
16 І жыў Магалялеэль па нараджэньні Ярэда васемсот трыццаць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
17 І былі ўсе дні Магалялеэля васемсот дзевяноста пяць гадоў, і ён памёр.
18 І жыў Ярэд сто шэсьцьдзясят два гады, і нарадзіў Эноха.
19 І жыў Ярэд па нараджэньні Эноха васемсот гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
20 І былі ўсе дні Ярэда дзевяцьсот шэсьцьдзясят два гады, і ён памёр.
21 І жыў Энох шэсьцьдзясят пяць гадоў і нарадзіў Мэтушэляха.
22 І хадзіў Энох з Богам па нараджэньні Мэтушэляха трыста гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
23 І былі ўсе дні Эноха трыста шэсьцьдзясят пяць гадоў.
24 І хадзіў Энох з Богам, і ня стала яго, бо забраў яго Бог.
25 І жыў Мэтушэлях сто восемдзясят сем гадоў, і нарадзіў Лямэха.
26 І жыў Мэтушэлях па нараджэньні Лямэха семсот восемдзясят два гады, і нарадзіў сыноў і дачок.
27 І былі ўсе дні Мэтушэляха дзевяцьсот шэсьцьдзясят дзевяць гадоў, і ён памёр.
28 І жыў Лямэх сто восемдзясят два гады, і нарадзіў сына,
29 і назваў яго імя Ной, кажучы: «Ён пацешыць нас у рабоце нашай і ў працы рук нашых на зямлі, якую пракляў ГОСПАД».
30 І жыў Лямэх па нараджэньні Ноя пяцьсот дзевяноста пяць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
31 І былі ўсе дні Лямэха семсот семдзясят сем гадоў, і ён памёр.
32 І было Ною пяцьсот гадоў, і нарадзіў Ной Сэма, Хама і Яфэта.

Бц 6

1 І сталася, што людзі пачалі множыцца на абліччы зямлі, і нарадзіліся ім дочкі.
2 І бачылі сыны Божыя дочак чалавечых, што яны прыгожыя, і ўзялі сабе за жонак усіх, якіх абралі.
3 І сказаў ГОСПАД: «Ня будзе Дух Мой змагацца ў чалавеку вечна, бо ён — цела. І будуць дні ягоныя сто дваццаць гадоў».
4 У тыя дні нэфілімы жылі на зямлі, а таксама пазьней, калі сыны Божыя прыходзілі да дочак чалавечых, і тыя ім нараджалі. Былі гэта волаты, ад вякоў мужы слаўныя.
5 І бачыў ГОСПАД, што вялікае зло [сярод] людзей на зямлі, і што ўсе намеры думак сэрца іхняга — толькі на зло ўсякі дзень.
6 І пашкадаваў ГОСПАД, што зрабіў чалавека на зямлі, і засмуціўся ў сэрцы Сваім.
7 І сказаў ГОСПАД: «Зьнішчу чалавека, якога стварыў, з аблічча зямлі, ад чалавека да скаціны, да паўзуна, да птушкі паднебнай, бо шкадую, што зрабіў іх».
8 А Ной знайшоў ласку ў вачах ГОСПАДА.
9 Вось радавод Ноя. Ной быў чалавек праведны і беззаганны ў пакаленьні сваім. Ной хадзіў з Богам.
10 І нарадзіў Ной трох сыноў: Сэма, Хама і Яфэта.
11 І сапсаваная была зямля перад абліччам Бога, і напоўнілася зямля ліхадзействам.
12 І бачыў Бог зямлю, і вось, яна сапсаваная, бо кожнае цела скрывіла шлях свой на зямлі.
13 І сказаў Бог Ною: «Канец усякаму целу прыйшоў перад аблічча Маё, бо зямля напоўнілася ліхадзействам праз іх. І вось, Я вынішчу іх з зямлі.
14 Зрабі сабе каўчэг з дрэва гафэр; зробіш у каўчэгу перагародкі і пацягні яго смалой звонку і знутры.
15 Вось так маеш зрабіць яго: трыста локцяў даўжыня каўчэгу, пяцьдзясят локцяў шырыня яго і трыццаць локцяў вышыня яго.
16 Зробіш вакно ў каўчэгу, і ў локаць скончыш яго ўгары. Уваход у каўчэг разьмесьціш з боку яго; ніжні, другі і трэці [паверхі] зробіш у ім.
17 І вось, Я ўзьвяду патоп водны на зямлю, каб вынішчыць пад небам усякае цела, у якім ёсьць дух жыцьця. Усё, што на зямлі, — загіне.

18 І Я заключу запавет Мой з табою, і ўвойдзеш у каўчэг ты, і сыны твае, і жонка твая, і жонкі
сыноў тваіх з табою.
19 І з усяго жывога, з кожнага цела прывядзеш па двое ў каўчэг, каб засталіся жывыя з табою,
мужчынскага [роду] і жаночага няхай яны будуць.
20 З птушак паводле гатункаў іх, са скаціны паводле гатунку яго і з усіх паўзуноў зямных
паводле гатункаў іх, з усіх па двое ўвойдуць да цябе, каб засталіся жывыя.
21 І ты вазьмі сабе ўсякай ежы, якою яны кормяцца, і зьбяры яе да сябе; і будзе яна для цябе і
для іх ежаю».
22 І зрабіў Ной; усё, што загадаў яму Бог, так ён і зрабіў.

Бц 7

1 І сказаў ГОСПАД Ною: «Увайдзі ты і ўвесь дом твой у каўчэг, бо ўбачыў Я цябе праведным
перад абліччам Маім у пакаленьні гэтым.
2 З усякай скаціны чыстай вазьмі з сабою сем самцоў і сем саміц, а са скаціны нячыстай — па
двое, самца і саміцу.
3 Таксама з птушак паднебных — сем мужчынскага [роду] і сем жаночага, каб захаваць жывым
насеньне [іхняе] на абліччы ўсёй зямлі.
4 Бо праз сем дзён Я выльлю дождж на зямлю сорак дзён і сорак начэй і вынішчу з аблічча
зямлі ўсіх жывых істотаў, якіх Я зрабіў.
5 І зрабіў Ной усё, што загадаў яму ГОСПАД.
6 І Ною было шэсьцьсот гадоў, і патоп водны быў на зямлі.
7 І ўвайшоў Ной, і сыны ягоныя, і жонка ягоная, і жонкі сыноў ягоных з ім у каўчэг ад вады
патопу.
8 Са скаціны чыстай і са скаціны, якая нячыстая, з птушак і з усяго, што поўзае па зямлі,
9 па двое ўвайшлі ў каўчэг да Ноя, мужчынскага [роду] і жаночага, як Бог загадаў Ною.
10 І сталася праз сем дзён, што вада патопу была на зямлі.
11 У шэсьцьсотым годзе жыцьця Ноя, у другім месяцы, у сямнаццаты дзень месяца, у гэты
дзень выбіліся ўсе жаролы вялікай бездані, і вокны нябесныя адчыніліся,
12 і ішоў дождж на зямлю сорак дзён і сорак начэй.
13 У гэты самы дзень увайшоў у каўчэг Ной, і Сэм, і Хам, і Яфэт, сыны Ноя, і жонка Ноя, і тры
жонкі сыноў ягоных з імі.
14 Яны, і ўсякія зьвяры паводле гатунку свайго, і ўсякая скаціна паводле гатунку свайго, і
ўсякія паўзуны, якія поўзаюць па зямлі, паводле гатунку свайго, і ўсякія птушкі паводле
гатунку свайго, усё птаства, усе крылатыя.
15 І ўвайшлі яны па двое ў каўчэг да Ноя, па двое з кожнага цела, у якім быў дух жыцьця.
16 І тыя, што ўвайшлі, былі мужчынскага [роду] і жаночага з усякага цела, як загадаў Бог. І
зачыніў ГОСПАД за імі [каўчэг].
17 І стаўся патоп на зямлі сорак дзён, і разьліліся воды, і паднялі каўчэг, і ён узвысіўся над
зямлёю.
18 І падымаліся воды, і вельмі ўзьняліся над зямлёю, і каўчэг плаваў па абліччы водаў.
19 І вельмі моцна падняліся воды над зямлёю, і закрылі ўсе высокія горы, якія ёсьць пад усім
небам.
20 На пятнаццаць локцяў угору падняліся воды, і закрылі горы.
21 І загінула ўсякае цела, якое рухаецца па зямлі: і птушкі, і скаціна, і зьвяры, і ўсе паўзуны,
што поўзаюць па зямлі, і ўсе людзі.
22 Усе, якія мелі дыханьне духа жыцьця ў ноздрах сваіх, усе, што былі на сухазем'і, —
паўміралі.
23 І вынішчыў [Бог] усякую жывую істоту, якая была на абліччы зямлі, ад чалавека да скаціны,
да паўзуноў і да птушак паднебных, і былі яны вынішчаны з зямлі. І застаўся толькі Ной і тыя,
што былі з ім у каўчэгу.
24 І падымаліся воды над зямлёю сто пяцьдзясят дзён.

Бц 8

1 І ўзгадаў Бог пра Ноя і пра ўсіх зьвяроў, і пра ўсю скаціну, што былі з ім у каўчэгу, і прывёў
Бог вецер на зямлю, і супакоіліся воды.
2 І зачыніліся жаролы бездані і вокны нябесныя, і спыніўся дождж з неба.
3 І вярталіся воды з зямлі, сьцякаючы і вяртаючыся, і паменшалі воды па заканчэньні ста
пяцідзесяці дзён.
4 І спыніўся каўчэг у сёмы месяц, у сямнаццаты дзень месяца, на гарах Арарат.
5 І воды сьцякалі і меншалі аж да дзясятага месяца, а ў дзясяты месяц, у першы дзень месяца,
сталі бачныя вяршыні гораў.
6 І сталася па заканчэньні сарака дзён Ной адчыніў вакно каўчэгу, якое зрабіў.
7 І выпусьціў ён крумкача, і той лятаў туды і сюды, і варочаўся, аж пакуль ня высахла вада на
зямлі.
8 І выпусьціў ён ад сябе галубку, каб убачыць, ці зыйшлі воды з аблічча зямлі.
9 І не знайшла галубка месца спачынку для ног сваіх, і вярнулася да яго ў каўчэг, бо воды былі
яшчэ на абліччы ўсёй зямлі. І ён выцягнуў руку сваю, і схапіў яе, і забраў да сябе ў каўчэг.
10 І пачакаў ён яшчэ сем дзён, і зноў выпусьціў галубку з каўчэгу.
11 І вярнулася галубка да яго ўвечары, і вось, сьвежы аліўкавы лісток у дзюбе ў яе. І зразумеў
Ной, што зыйшлі воды з зямлі.
12 І пачакаў ён яшчэ іншых сем дзён, і выпусьціў галубку, і яна ўжо больш да яго не вярнулася.
13 І сталася, у шэсьцьсот першым годзе, у першым месяцы, у першы дзень месяца, што воды
на зямлі павысыхалі. І Ной адкрыў дах каўчэгу, і ўбачыў, што, вось, высахла аблічча зямлі.
14 А ў другім месяцы, у дваццаць сёмы дзень месяца зямля абсохла.
15 І сказаў Бог Ною, кажучы:
16 «Выйдзі з каўчэгу ты і жонка твая, і сыны твае, і жонкі сыноў тваіх з табою.
17 Усіх зьвяроў, якія з табою з кожнага цела, як з птушак, так і са скаціны, і з усіх паўзуноў,
што рухаюцца па зямлі, вывядзі з сабою. І няхай разыходзяцца яны на зямлі, няхай плодзяцца
і множацца на зямлі».
18 І выйшаў Ной, і сыны ягоныя, і жонка ягоная, і жонкі сыноў ягоных з ім.
19 Усе зьвяры, усе паўзуны, усе птушкі і ўсё, што рухаецца па зямлі, паводле родаў сваіх,
выйшлі з каўчэгу.
20 І збудаваў Ной ахвярнік ГОСПАДУ, і ўзяў з кожнай скаціны чыстай і з кожнай птушкі чыстай,
і склаў іх у ахвяру цэласпаленьня на ахвярніку.
21 І адчуў ГОСПАД пах прыемны, і сказаў ГОСПАД у сэрцы Сваім: «Ня буду больш праклінаць
зямлю з-за чалавека, бо настаўленьне сэрца чалавечага злое ад маладосьці яго. І больш ня
буду забіваць усяго жывога, як гэта зрабіў.
22 І яшчэ, у-ва ўсе дні зямлі ня спыняцца сяўба і жніво, сьцюжа і сьпякота, лета і зіма, дзень і
ноч».

Бц 9

1 І дабраславіў Бог Ноя і сыноў ягоных, і сказаў ім: «Пладзіцеся і множцеся, і напаўняйце
зямлю.
2 Няхай баяцца вас і дрыжаць перад вамі ўсе зьвяры зямныя, і ўсе птушкі паднебныя; і ўсё, што
рухаецца па зямлі, і ўсе рыбы марскія аддадзеныя ў рукі вашыя.
3 Усё, што рухаецца, што жыве, будзе вам на ежу; як траву зялёную, Я даў вам усё.
4 Толькі цела з душою ягонай, з крывёю яго, ня ешце.
5 І толькі кроў вашу душаў вашых Я буду шукаць; з рукі ўсякага зьвера буду шукаць яе; і з рукі
чалавека, з рукі кожнага брата ягонага буду шукаць душу чалавека.
6 Хто праліе кроў чалавека, таго кроў будзе праліта рукою чалавека, бо чалавек зроблены на
вобраз Божы.
7 А вы пладзіцеся і множцеся, распаўсюджвайцеся на зямлі і множцеся на ёй».
8 І сказаў Бог Ною і сынам ягоным з ім, кажучы:
9 «Вось, Я заключаю запавет Мой з вамі і з насеньнем вашым пасьля вас,

10 і з усякаю душою жывою, якая з вамі: з птушкамі, са скацінай і з усімі зьвярамі зямнымі,
якія з вамі, з усімі, што выйшлі з каўчэгу, з усімі зьвярамі зямлі.
11 І Я заключаю запавет Мой з вамі, і ўжо больш ня будзе вынішчана ўсякае цела водамі патопу,
і больш ня будзе патопу, каб нішчыць зямлю».
12 І сказаў Бог: «Гэта знак запавету, які Я заключаю паміж Мною і вамі і ўсякай душой жывою,
якая з вамі, у пакаленьні вечныя.
13 Вясёлку Маю кладу на хмарах, і будзе яна знакам запавету паміж Мною і паміж зямлёю.
14 І станецца, калі расьцягну хмары над зямлёю, будзе відаць вясёлку на хмарах,
15 і Я ўзгадаю запавет Мой, які паміж Мною і вамі і ўсякай душой жывою ў-ва ўсякім целе, і ня
будзе больш водаў патопу, каб нішчыць усякае цела.
16 І будзе гэтая вясёлка на хмарах, і Я ўбачу яе, і ўзгадаю запавет вечны паміж Богам і ўсякай
душой жывою ў-ва ўсякім целе, якое ёсьць на зямлі».
17 І сказаў Бог Ною: «Гэта знак запавету, які Я даю, паміж Мною і ўсякім целам, якое ёсьць на
зямлі».
18 І былі сыны Ноя, якія выйшлі з каўчэгу: Сэм, Хам і Яфэт. А Хам быў бацькам Ханаана.
19 Гэтыя тры былі сынамі Ноя, і ад іх напоўнілася [людзьмі] ўся зямля.
20 І Ной пачаў абрабляць зямлю, і пасадзіў вінаграднік.
21 І выпіў ён віна, і напіўся, і ляжаў голы ў сярэдзіне намёту.
22 І ўбачыў Хам, бацька Ханаана, голасьць бацькі свайго, і распавёў двум братам сваім, [якія
былі] звонку.
23 І ўзялі Сэм і Яфэт адзежу і ўсклалі на плечы свае, і пайшлі сьпінаю, і накрылі голасьць бацькі
свайго; і абліччы іхнія былі [зьвернутыя] назад, і яны ня бачылі голасьці бацькі свайго.
24 І прачнуўся Ной ад ап'яненьня свайго, і даведаўся, што яму зрабіў малодшы сын ягоны,
25 і сказаў: «Пракляты Ханаан! Будзе ён слугою слугаў у братоў сваіх».
26 І сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Сэма! Няхай будзе Ханаан слугою ягоным.
27 Няхай пашырыць Бог Яфэта, і будзе ён жыць у намётах Сэма, і Ханаан будзе ў яго слугою».
28 І жыў Ной пасьля патопу трыста пяцьдзясят гадоў.
29 І было ўсіх дзён Ноя дзевяцьсот пяцьдзясят гадоў, і ён памёр.

Бц 10

1 Вось радавод сыноў Ноя: Сэма, Хама і Яфэта. І нарадзіліся ім сыны пасьля патопу.
2 Сыны Яфэта: Гамэр, Магог, Мадай, Яван, Туваль, Мэшэх і Тырас.
3 Сыны Гамэра: Ашкеназ, Рыфат і Тагарма.
4 Сыны Явана: Эліша і Таршыш, Кіттым і Даданім.
5 Ад іх паходзяць астравы народаў у землях іхніх, кожны паводле мовы сваёй і паводле
плямёнаў сваіх, у народах сваіх.
6 Сыны Хама: Куш, Міцраім, Пут і Ханаан.
7 Сыны Куша: Сэва, Хавіля, Саўта, Раама і Саўтэха. Сыны Раамы: Шэва і Дэдан.
8 А Куш нарадзіў Німрода. Ён пачаў быць волатам на зямлі.
9 Ён быў магутны паляўнічы перад абліччам ГОСПАДА. Таму кажуць: «Як Німрод, магутны
паляўнічы перад абліччам ГОСПАДА».
10 І пачаткам валадараньня яго былі Бабілон, Эрэх, Акад і Кальнэ ў зямлі Шынаар.
11 З той зямлі выйшаў Ашур і пабудаваў Ніневу, Рэхавот-Ір, Калях
12 і Рэсэн, вялікі горад між Нінівай і Каляхам.
13 А Міцраім нарадзіў Людыма, Анаміма, Легавіма, Нафтухіма,
14 Патрусіма і Касьлюхіма, ад якіх паходзяць Філістынцы, і Кафторыма.
15 А Ханаан нарадзіў Сідона, першароднага свайго, і Хета,
16 Евусэя, Амарэя, Гіргашэя,
17 Хівея, Аркея, Сінэя,
18 Арвадэя, Цэмарэя і Хаматэя; а пасьля расьсеяліся плямёны Хананейскія.

19 І была мяжа Хананейцаў ад Сідону ў накірунку Герару аж да Газы, а ў накірунку Садома і
Гаморы, Адмы і Цэвоіма — аж да Ляшы.
20 Гэта сыны Хама паводле плямёнаў сваіх, паводле моваў сваіх, у землях сваіх і ў народах
сваіх.
21 А Сэм, бацька ўсіх сыноў Эвэра, старэйшы брат Яфэта, нарадзіў [сыноў].
22 Сыны Сэма: Элям, Ашур, Арпахшад, Люд і Арам.
23 Сыны Арама: Уц, Хуль, Гетэр і Маш.
24 А Арпахшад нарадзіў Шэляха, а Шэлях нарадзіў Эвэра.
25 А ў Эвэра нарадзіліся два сыны: аднаго імя Пэлег, таму што ў дні ягоныя разьдзялілася
зямля, а імя брата ягонага — Ёктан.
26 Ёктан нарадзіў Альмадада, Шалефа, Хацармавэта, Яраха,
27 Гадарама, Узаля, Дыклю,
28 Аваля, Авімаэля, Шэву,
29 Афіра, Хавіля і Ёвава. Гэтыя ўсе — сыны Ёктана.
30 Месца іх пражываньня было ад Мэшы ў накірунку Сэфару на ўсход.
31 Гэта сыны Сэма паводле плямёнаў сваіх, паводле моваў сваіх, у землях сваіх і ў народах
сваіх.
32 Гэта вось плямёны сыноў Ноя паводле радаводаў у народах сваіх. Ад іх распаўсюдзіліся
народы на зямлі пасьля патопу.

Бц 11

1 І была на ўсёй зямлі адна мова і адны словы.
2 І сталася, калі яны вандравалі з усходу, знайшлі раўніну ў зямлі Шынаар і там пасяліліся.
3 І сказалі яны адзін аднаму: «Давайце наробім цэглы і абпалім яе агнём». І была ў іх цэгла
замест камянёў, а смала была ў іх замест вапны.
4 І сказалі яны: «Давайце зробім сабе горад і вежу, у якой верх будзе да неба, і гэтым зробім
сабе імя, каб не расьцярушыліся мы па абліччы ўсёй зямлі».
5 І зыйшоў ГОСПАД, каб убачыць горад і вежу, якую будавалі сыны чалавечыя.
6 І сказаў ГОСПАД: «Вось, адзін народ і адна для ўсіх мова. І вось, што пачалі яны рабіць. І
цяпер не спыніць іх у-ва ўсім, што яны задумалі зрабіць.
7 Давайце зыйдзем і памяшаем там мову іхнюю, каб не маглі разумець мовы адзін аднаго».
8 І расьцярушыў іх ГОСПАД з таго месца па абліччы ўсёй зямлі, і яны перасталі будаваць горад.
9 Дзеля таго названа імя яго Бабілон, бо там зьмяшаў ГОСПАД мову ўсёй зямлі, і адтуль
расьцярушыў іх ГОСПАД па абліччы ўсёй зямлі.
10 Вось радавод Сэма. Сэм меў сто гадоў і нарадзіў Арпахшада праз два гады пасьля патопу.
11 І жыў Сэм па нараджэньні Арпахшада пяцьсот гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
12 І Арпахшад жыў трыццаць пяць гадоў, і нарадзіў Шэляха.
13 І жыў Арпахшад па нараджэньні Шэляха чатырыста тры гады, і нарадзіў сыноў і дачок.
14 І Шэлях жыў трыццаць гадоў, і нарадзіў Эвэра.
15 І жыў Шэлях па нараджэньні Эвэра чатырыста тры гады, і нарадзіў сыноў і дачок.
16 І жыў Эвэр трыццаць чатыры гады, і нарадзіў Пэлега.
17 І жыў Эвэр па нараджэньні Пэлега чатырыста трыццаць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
18 І жыў Пэлег трыццаць гадоў, і нарадзіў Рэву.
19 І жыў Пэлег па нараджэньні Рэву дзьвесьце дзевяць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
20 І жыў Рэву трыццаць два гады, і нарадзіў Сэруга.
21 І жыў Рэву па нараджэньні Сэруга дзьвесьце сем гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
22 І жыў Сэруг трыццаць гадоў, і нарадзіў Нахора.
23 І жыў Сэруг па нараджэньні Нахора дзьвесьце гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.
24 І жыў Нахор дваццаць дзевяць гадоў, і нарадзіў Тэраха.
25 І жыў Нахор па нараджэньні Тэраха сто дзевятнаццаць гадоў, і нарадзіў сыноў і дачок.

26 І жыў Тэрах семдзясят гадоў, і нарадзіў Абрама, Нахора і Арана.
27 І вось радавод Тэраха. Тэрах нарадзіў Абрама, Нахора і Арана, а Аран нарадзіў Лота.
28 І памёр Аран перад абліччам Тэраха, бацькі свайго, у зямлі нараджэньня свайго, у Уры Халдэйскім.
29 І ўзялі Абрам і Нахор сабе жонак. Імя жонкі Абрама — Сарай, а імя жонкі Нахора — Мілька, дачка Арана, бацькі Мількі і бацькі Іскі.
30 І была Сарай бясплодная, яна ня мела дзяцей.
31 І ўзяў Тэрах Абрама, сына свайго, і Лота, сына Арана, унука свайго, і Сарай, нявестку сваю, жонку Абрама, сына свайго, і выйшаў з імі з Уру Халдэйскага, каб ісьці ў зямлю Ханаан. І прыйшлі ў Харан, і пасяліліся там.
32 І было дзён Тэраха дзьвесьце пяць гадоў жыцьця, і памёр Тэрах у Харане.

Бц 12

1 І сказаў ГОСПАД Абраму: «Выйдзі з зямлі тваёй і ад родзічаў тваіх, і з дому бацькі твайго ў зямлю, якую Я пакажу табе.
2 І Я зраблю з цябе вялікі народ, і дабраслаўлю цябе, і ўзьвялічу імя тваё, і будзеш ты дабраславенствам.
3 І Я дабраслаўлю тых, якія будуць дабраслаўляць цябе, а тых, якія будуць праклінаць цябе, Я пракляну. І будуць дабраслаўлёныя ў табе ўсе плямёны зямлі».
4 І пайшоў Абрам, як загадаў яму ГОСПАД, і з ім пайшоў Лот. Абрам меў семдзясят пяць гадоў, калі выйшаў з Харану.
5 І ўзяў Абрам Сарай, жонку сваю, і Лота, сына брата свайго, і ўсю маёмасьць, якую прыдбалі, і слугаў, якіх набылі ў Харане, і выйшлі, каб пайсьці ў зямлю Ханаан. І прыйшлі яны ў зямлю Ханаан.
6 І прайшоў Абрам гэтую зямлю аж да мясцовасьці Сыхем, аж да дубровы Марэ. А ў той зямлі [жылі] тады Хананейцы.
7 І зьявіўся ГОСПАД Абраму, і сказаў: «Насеньню твайму Я дам гэтую зямлю». І ён збудаваў там ахвярнік ГОСПАДУ, Які зьявіўся яму.
8 Адтуль перайшоў ён на гару на ўсход ад Бэтэлю і паставіў намёт свой, [маючы] Бэтэль на захадзе, а Гай на ўсходзе. І там збудаваў ахвярнік ГОСПАДУ, і заклікаў імя ГОСПАДА.
9 І вандраваў Абрам далей, і павандраваў у Нэгеў.
10 І стаўся голад у той зямлі. І зыйшоў Абрам у Эгіпет, каб пажыць там, бо вялікі голад быў у той зямлі.
11 І сталася, калі набліжаліся яны да Эгіпту, сказаў ён жонцы сваёй Сарай: «Вось, я ведаю, што ты жанчына прыгожая,
12 і станецца, калі ўбачаць цябе Эгіпцяне і скажуць: “Гэта жонка яго”, яны заб’юць мяне, а цябе пакінуць.
13 Дык кажы, што ты — сястра мая, каб мне было добра дзеля цябе і каб я застаўся жывы дзякуючы табе».
14 І сталася, калі Абрам прыйшоў у Эгіпет, убачылі Эгіпцяне, што [Сарай] вельмі прыгожая жанчына.
15 І ўбачылі яе князі фараона, і хвалілі яе перад фараонам. І была ўзятая жанчына ў дом фараона.
16 А Абраму было добра дзеля яе. І сталася, што атрымаў ён авечак і валоў, і аслоў, і слугаў, і нявольніцаў, і асьліцаў, і вярблюдаў.
17 І наведаў ГОСПАД фараона і дом ягоны вялікімі карамі з прычыны Сарай, жонкі Абрама.
18 І паклікаў фараон Абрама, і сказаў [яму]: «Што ты мне зрабіў? Чаму не сказаў мне, што яна — жонка твая?
19 Чаму ты казаў: “Яна — сястра мая”, і я ўзяў яе сабе за жонку? Вось табе жонка твая, бяры і ідзі!»
20 І загадаў фараон людзям сваім, і яны выслалі [Абрама], і жонку ягоную, і ўсё, што ён меў.

Бц 13

1 І падняўся Абрам з Эгіпту сам і жонка ягоная, і ўсё, што ён меў, і Лот з ім, у Нэгеў.
2 І быў Абрам вельмі багаты статкамі, срэбрам і золатам.
3 І ён ішоў у падарожжы сваім з Нэгеву ў Бэтэль, аж да месца, дзе раней быў намёт ягоны між Бэтэлем і Гаем,
4 да таго месца, дзе раней ён збудаваў ахвярнік; і там клікаў Абрам імя ГОСПАДА.
5 Таксама Лот, які ішоў з Абрамам, меў авечак, валоў і намёты.
6 І не магла зямля насіць іх, каб жылі разам, бо маёмасьць іх была вялікая і не маглі яны жыць разам.
7 І была спрэчка паміж пастухамі статкаў Абрама і пастухамі статкаў Лота. А ў той час Хананейцы і Пэрэзэі жылі ў той зямлі.
8 І сказаў Абрам Лоту: «Няхай ня будзе спрэчкі паміж мной і табой, і паміж пастухамі маімі і пастухамі тваімі, бо мы ж браты.
9 Ці ня ўся гэтая зямля перад табою? Прашу, адлучыся ад мяне! Калі ты ўлева, дык я — управа, а калі ты ўправа, дык я — улева».
10 І ўзьняў Лот вочы свае, і ўбачыў усю ваколіцу каля Ярдану аж да Цаару, бо ўся яна была [напоеная] вадой перад тым, як зьнішчыў ГОСПАД Садом і Гамору, як сад ГОСПАДА і як зямля Эгіпецкая.
11 І выбраў сабе Лот усю ваколіцу каля Ярдану. І рушыў Лот на ўсход, і аддзяліліся яны адзін ад аднаго.
12 Абрам жыў у зямлі Ханаан, а Лот жыў у гарадах той ваколіцы і паставіў намёты аж да Садому.
13 А жыхары Садому былі ліхімі і вялікімі грэшнікамі перад ГОСПАДАМ.
14 І сказаў ГОСПАД Абраму пасьля таго, як Лот адлучыўся ад яго: «Узьнімі вочы твае і паглядзі з месца, дзе ты цяпер, на поўнач і на поўдзень, на ўсход і на захад.
15 Бо ўсю зямлю, якую бачыш, Я дам табе і насеньню твайму на вякі.
16 І зраблю насеньне тваё, як пясок зямлі. Калі чалавек зможа палічыць пясок зямлі, тады і тваё насеньне палічана будзе.
17 Устань і прайдзі па зямлі гэтай у даўжыню і шырыню яе, бо Я дам яе табе».
18 І паставіў Абрам намёт, і пайшоў, і абжыўся каля дубровы Мамрэ, што ў Хеўроне, і пабудаваў там ахвярнік ГОСПАДУ.

Бц 14

1 І сталася ў дні Амрафэля, валадара Шынаару, і Арыёха, валадара Элясару, і Кедарляамэра, валадара Эляму, і Тыдаля, валадара Гаіму,
2 пачалі яны вайну супраць Бэры, валадара Садому, і Біршы, валадара Гаморы, і Шынава, валадара Адмы, і Шэмэвэра, валадара Цэвоіму, і валадара Бэлі або Цаару.
3 Усе яны злучыліся ў даліне Сыддым, яна [цяпер] Мора Салёнае.
4 Дванаццаць гадоў служылі яны Кедарляамэру, а ў трынаццатым годзе ўзбунтаваліся.
5 А ў чатырнаццатым годзе прыйшоў Кедарляамэр і валадары, якія з ім, і пабілі Рэфаімаў у Аштэрот-Карнаіме, і Зузімаў у Гаме, і Эмімаў у Шавэ-Кірыятаіме,
6 і Харэяў на гары іхняй Сэір аж да Эль-Парану, што ў пустыні.
7 І вярнуліся яны, і прыйшлі да Эн-Мішпату, які [цяпер] Кадэш, і пабілі ўсю краіну Амалека, а таксама Амарэяў, што жылі ў Хацацон-Тамары.
8 І выйшаў валадар Садому, і валадар Гаморы, і валадар Адмы, і валадар Цэвоіму, і валадар Бэлі або Цаару, і пашыхтаваліся ў даліне Сыддым да бою
9 з Кедарляамэрам, валадаром Эляму, і Тыдалем, валадаром Гаіму, і Амрафэлем, валадаром Шынаару, і Арыёхам, валадаром Элясару, чатыры валадары супраць пяці.
10 І былі ў даліне Сыддым ямы, ямы смалавыя. І ўцякалі валадары Садому і Гаморы, і ўпалі ў тыя [ямы], а астатнія ўцяклі на гару.
11 І ўзялі [пераможцы] ўсю маёмасьць Садому і Гаморы і ўсе запасы харчоў, і пайшлі.

12 І ўзялі яны Лота, сына брата Абрама, і маёмасьць ягоную, і пайшлі. А ён жыў у Садоме.
13 І прыйшоў адзін з тых, што ўцяклі, і паведаміў Абраму Гебраю, які жыў каля дубровы Мамрэ
Амарэя, брата Эшколя і брата Анэра, якія заключылі запавет з Абрамам.
14 І пачуў Абрам, што ўзяты ў палон брат ягоны, і ўзброіў трыста васямнаццаць спраўных
[слугаў] сваіх, народжаных у доме яго, і рушыў у пагоню аж пад Дан.
15 І, падзяліўшыся, напаў на іх ноччу, ён і слугі ягоныя, і разьбіў іх, і гнаў іх аж да Ховы, што
зьлева ад Дамаску.
16 І вярнуў ён усю маёмасьць, а таксама Лота, брата свайго, і маёмасьць ягоную, і жанчынаў, і
народ.
17 І выйшаў валадар Садому насустрач яму, калі ён вяртаўся пасьля пабіцьця Кедарляамэра і
валадароў, што з ім былі, у даліну Шавэ, яна [цяпер] даліна Валадарская.
18 І Мэльхісэдэк, валадар Салему, вынес хлеб і віно, а ён быў сьвятаром Бога Найвышэйшага,
19 і дабраславіў яго, і сказаў: «Дабраслаўлёны Абрам праз Бога Найвышэйшага, Пана неба і
зямлі.
20 І дабраслаўлёны Бог Найвышэйшы, Які аддаў ворагаў тваіх у рукі твае». І даў яму [Абрам]
дзесяціну з усяго.
21 І сказаў валадар Садому Абраму: «Аддай мне людзей, а маёмасьць вазьмі сабе».
22 І сказаў Абрам валадару Садому: «Узьнімаю руку маю да ГОСПАДА, Бога Найвышэйшага,
Пана неба і зямлі,
23 што ані ніткі, ані раменьчыка ад сандалаў, нічога не вазьму з усяго таго, што тваё, каб ты не
сказаў: “Я ўзбагаціў Абрама”,
24 акрамя таго, што зьелі юнакі, і акрамя часткі для людзей, якія хадзілі са мною. Анэр, Эшколь
і Мамрэ няхай возьмуць частку сваю».

Бц 15

1 Пасьля гэтых падзеяў было слова ГОСПАДА да Абрама ў відзежы, кажучы: «Ня бойся, Абраме!
Я — шчыт твой, узнагарода твая вельмі вялікая».
2 І сказаў Абрам: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ, што Ты дасі мне? Я хаджу бязьдзетны, і распарадчык у
доме маім — Эліезэр з Дамаску».
3 І сказаў Абрам: «Вось, ня даў Ты мне насеньня. І вось, народжаны ў доме маім [слуга] будзе
спадкаемцам маім».
4 І вось, слова ГОСПАДА да яго, кажучы: «Ня ён успадкаеміць цябе, але той, які выйдзе з нутра
твайго, успадкаеміць цябе».
5 І вывеў яго вонкі, і сказаў: «Паглядзі на неба і палічы зоркі, калі зможаш палічыць іх». І
сказаў яму: «Такім будзе насеньне тваё».
6 І паверыў ён ГОСПАДУ, і Ён залічыў гэта яму за праведнасьць.
7 І сказаў яму: «Я — ГОСПАД, Які вывеў цябе з Уру Халдэйскага, каб даць табе гэтую зямлю ў
валоданьне».
8 А ён сказаў: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ, з чаго магу ведаць, што я буду валодаць ёю?»
9 І [Госпад] сказаў яму: «Вазьмі Мне трохгадовую цялушку, і трохгадовую казу, і трохгадовага
барана, туркаўку і галубянятка».
10 І [Абрам] узяў усё гэта, і расьцяў іх уздоўж, і паклаў кожную частку адну насупраць другой,
але птушак не расьцінаў.
11 І зьляцеліся драпежныя птушкі на гэтае мяса, і Абрам адганяў іх.
12 І сталася, калі сонца заходзіла, моцны сон ахапіў Абрама. І вось, жах і цемра вялікая ахапілі
яго.
13 І сказаў [Госпад] Абраму: «Ведаючы, ведай, што насеньне тваё будзе прыхаднямі ў зямлі не
сваёй, і будуць служыць яны, і будуць прыгнятаць іх чатырыста гадоў.
14 Але з народам, якому будуць яны служыць, Я буду змагацца, і пасьля таго выйдуць яны з
вялікай маёмасьцю.
15 А ты пойдзеш да бацькоў сваіх у супакоі, і будзеш пахаваны ў добрай старасьці.

16 І ў чацьвёртым пакаленьні яны вернуцца сюды, бо яшчэ не дапоўнілася мера беззаконьняў
Амарэяў».
17 І сталася, калі зайшло сонца і была цемра, вось, дым, нібы з печы, і полымя агню прайшлі
між расьцятымі жывёламі.
18 У той дзень заключыў ГОСПАД з Абрамам запавет, кажучы: «Я даю гэтую зямлю насеньню
твайму, ад ракі Эгіпецкай аж да вялікай ракі, ракі Эўфрат:
19 Кенэяў, Кенэзэяў, Кадманеяў,
20 Хетаў, Пэрэзэяў, Рэфаімаў,
21 Амарэяў, Хананейцаў, Гіргашэяў і Евусэяў».

Бц 16

1 А Сарай, жонка Абрама, не нараджала яму. І мела яна нявольніцу Эгіпцянку, а імя ейнае —
Агар.
2 І сказала Сарай Абраму: «Вось, замкнуў ГОСПАД мяне, каб я не нараджала. Дык увайдзі да
нявольніцы маёй, можа ад яе атрымаю [дзіця]». І паслухаў Абрам голасу Сарай.
3 І ўзяла Сарай, жонка Абрама, Агар Эгіпцянку, нявольніцу сваю, калі мінула дзесяць гадоў
жыцьця Абрама ў зямлі Ханаан, і дала яе Абраму, мужу свайму, за жонку.
4 І ён увайшоў да Агар, і яна зачала, і ўбачыла, што зачала, і стала пагарджаць гаспадыняй
сваёй у вачах сваіх.
5 І сказала Сарай Абраму: «Крыўда мая праз цябе! Я дала табе нявольніцу маю на ўлоньне
тваё, і яна ўбачыла, што зачала, і стала пагарджаць мною ў вачах сваіх. Няхай ГОСПАД судзіць
паміж мной і табой».
6 І сказаў Абрам Сарай: «Вось, нявольніца твая ў руцэ тваёй, рабі з ёй, што добра ў вачах тваіх».
І Сарай стала ўціскаць яе, і яна ўцякла ад аблічча яе.
7 І знайшоў яе анёл ГОСПАДА каля крыніцы вады ў пустыні, каля крыніцы пры дарозе на Шур,
8 і сказаў: «Агар, нявольніца Сарай, адкуль ты прыйшла і куды ідзеш?» Яна адказала: «Ад
аблічча Сарай, гаспадыні маёй, я ўцякаю».
9 І сказаў ёй анёл ГОСПАДА: «Вярніся да гаспадыні сваёй і скарыся пад руку яе».
10 І сказаў ёй анёл ГОСПАДА: «Памнажаючы, памножу насеньне тваё, нельга будзе палічыць
яго з прычыны мноства».
11 І сказаў ёй анёл ГОСПАДА: «Вось, ты зачала і народзіш сына, і назавеш імя ягонае Ізмаэль,
таму што ГОСПАД пачуў пра ўціск твой.
12 І будзе ён чалавекам, [падобным да] дзікага асла, рука ягоная супраць усіх, і рукі ўсіх —
супраць яго; і будзе ён жыць перад абліччам усіх братоў сваіх».
13 І назвала яна імя ГОСПАДА, Які прамаўляў да яе: «Ты — Бог, Які бачыць мяне». Бо сказала
яна: «Ці ня тут я бачыла Таго, Які бачыць мяне».
14 Дзеля таго калодзеж гэты назвалі Бээр-Ляхай-Рой. Вось, ён паміж Кадэшам і Барэдам.
15 І нарадзіла Агар Абраму сына. І назваў Абрам імя сына свайго, якога нарадзіла яму Агар,
Ізмаэль.
16 Абрам меў восемдзясят шэсьць гадоў, калі Агар нарадзіла Ізмаэля Абраму.

Бц 17

1 І было Абраму дзевяноста дзевяць гадоў. І зьявіўся ГОСПАД Абраму, і сказаў яму: «Я — Бог
Усемагутны. Хадзі перад абліччам Маім і будзь беззаганны.
2 І Я заключу запавет Мой паміж Мной і табой, і павялічу цябе вельмі, вельмі».
3 І ўпаў Абрам на аблічча сваё, а Бог прамовіў да яго, кажучы:
4 «Я [ёсьць], вось запавет Мой з табою, і ты будзеш бацькам мноства народаў.
5 І ўжо ня будзе звацца імя тваё Абрам, але будзе імя тваё Абрагам, бо Я паставіў цябе бацькам
мноства народаў.
6 І Я павялічу цябе вельмі, вельмі, і выведу з цябе народы, і будуць паходзіць ад цябе валадары.

7 І Я заключу запавет Мой паміж Мною і табой, і насеньнем тваім пасьля цябе ў пакаленьнях іхніх як запавет вечны, што Я буду Богам тваім і насеньня твайго пасьля цябе.
8 І Я дам табе і насеньню твайму пасьля цябе зямлю вандраваньня твайго, усю зямлю Ханаан на ўласнасьць вечную, і Я буду ім Богам».
9 І сказаў Бог Абрагаму: «А ты захоўвай запавет Мой, ты і насеньне тваё пасьля цябе ў пакаленьнях сваіх.
10 Гэта вось запавет Мой, які вы павінны захаваць паміж Мной і вамі, і насеньнем тваім пасьля цябе: няхай будзе ў вас абрэзаны кожны мужчынскага роду.
11 І вы будзеце абразаць цела скуравінкі вашай, і будзе гэта на знак запавету паміж Мною і вамі.
12 У восьмы дзень ад нараджэньня няхай будзе абрэзаны ў вас кожны мужчынскага роду ў пакаленьнях вашых, народжаны ў доме або куплены за грошы ў кожнага чужынца, які ня ёсьць з насеньня твайго.
13 Мае быць абрэзаны і народжаны ў доме тваім, і куплены за срэбра тваё; і будзе запавет Мой на целе вашым як запавет вечны.
14 А неабрэзаны мужчынскага роду, які не абрэжа цела скуравінкі сваёй, няхай будзе вынішчана душа тая з народу свайго, бо ён парушыў запавет Мой».
15 І сказаў Бог Абрагаму: «Сарай, жонку тваю, ня будзеш зваць імя яе Сарай, але Сара будзе імя яе.
16 І Я дабраслаўлю яе, і дам з яе табе сына. І Я дабраслаўлю яе, і стануцца з яе народы, і валадары народаў будуць з яе».
17 І ўпаў Абрагам на аблічча сваё, і засьмяяўся, і сказаў у сэрцы сваім: «Ці ж стогадоваму народзіцца хто? І ці Сара, дзевяностагадовая, можа нарадзіць?»
18 І сказаў Абрагам Богу: «О, каб хоць Ізмаэль жыў перад абліччам Тваім!»
19 І сказаў Бог: «Але Сара, жонка твая, народзіць табе сына, і ты назавеш імя ягонае Ісаак; і Я заключу запавет Мой з ім як запавет вечны і з насеньнем яго пасьля яго.
20 І адносна Ізмаэля Я пачуў цябе. Вось, Я дабраслаўлю яго, і распладжу яго, і памножу яго вельмі, вельмі; ён народзіць дванаццаць князёў, і Я зраблю яго народам вялікім.
21 Але запавет Мой Я заключу з Ісаакам, якога народзіць табе Сара ў гэты самы час у наступным годзе».
22 І скончыў прамаўляць да яго, і ўзьняўся Бог ад Абрагама.
23 І ўзяў Абрагам Ізмаэля, сына свайго, і ўсіх народжаных у доме сваім, і ўсіх купленых за срэбра сваё, усіх мужчынскага роду з дому Абрагама, і абрэзаў цела скуравінкі іхняй у той самы дзень, калі прамаўляў да яго Бог.
24 Абрагам меў дзевяноста дзевяць гадоў, калі абрэзаў цела скуравінкі сваёй,
25 а Ізмаэль, сын ягоны, меў трынаццаць гадоў, калі было абрэзана цела скуравінкі ягонай.
26 У той самы дзень былі абрэзаны Абрагам і Ізмаэль, сын ягоны.
27 І ўсе мужчыны дому ягонага, народжаныя ў доме і купленыя за срэбра ў чужынцаў, былі абрэзаныя з ім.

Бц 18

1 І зьявіўся яму ГОСПАД каля дубровы Мамрэ, калі ён сядзеў каля ўваходу ў намёт у сьпякоту дня.
2 І падняў ён вочы свае, і глянуў, і вось, тры мужы стаяць насупраць яго. І ён убачыў, і выбег ад уваходу ў намёт насустрач ім, і пакланіўся да зямлі,
3 і сказаў: «Госпадзе, калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх, прашу, не мінай слугі Свайго.
4 Возьмуць трохі вады, і абмыюць ногі Вашыя, і прыхінецеся пад дрэвам.
5 А я вазьму кавалак хлеба, і пасіліце сэрцы Вашыя, потым пойдзеце, бо дзеля гэтага вы прайшлі каля слугі Вашага». Яны сказалі: «Зрабі так, як сказаў».
6 І пасьпяшаўся Абрагам у намёт да Сары, і сказаў: «Пасьпяшайся, замяшай тры меркі найлепшай мукі і зрабі аладак».

7 І пабег Абрагам да быдла, і ўзяў тлустае і добрае цяля, і даў юнаку, і той хутка прыгатаваў
яго.
8 І ўзяў масла і малака, і цяля, якое прыгатаваў, і паклаў перад абліччам Іх, і сам стаў каля Іх
пад дрэвам, і яны елі.
9 І сказалі яму: «А дзе Сара, жонка твая?» Ён сказаў: «Вось, у намёце».
10 А Той сказаў: «Вяртаючыся, вярнуся да цябе ў гэты час жыцьця [праз год], і вось, будзе сын
у Сары, жонкі тваёй». А Сара слухала каля ўваходу ў намёт, які быў за ім.
11 Абрагам жа і Сара былі старыя, увайшлі ў гады, і спынілася ў Сары звычайнае жаночае.
12 І засьмяялася Сара ў сабе, кажучы: «Пасьля таго, як я састарэла, ці ж буду мець асалоду? І
гаспадар мой стары».
13 І сказаў ГОСПАД Абрагаму: «Чаму сьмяялася Сара, кажучы: “Няўжо я сапраўды магу
нарадзіць, калі я старая?”
14 Ці ж ёсьць справа, цяжкая для ГОСПАДА? У прызначаны час вярнуся да цябе ў гэты час
жыцьця [праз год], і Сара будзе мець сына».
15 І запярэчыла Сара, кажучы: «Я не сьмяялася», бо яна спалохалася. Але Ён сказаў: «Не, ты
сьмяялася!»
16 І падняліся адтуль тыя мужы, і скіравалі аблічча Сваё да Садому, а Абрагам пайшоў з Імі,
праводзячы Іх.
17 І ГОСПАД сказаў: «Ці ж схаваю Я перад Абрагамам, што маю зрабіць?
18 Абрагам станецца народам вялікім і магутным, і будуць дабраслаўлёныя ў ім усе народы
зямлі.
19 Бо Я спазнаў яго, каб ён загадаў сынам сваім і дому свайму пасьля сябе, і будуць захоўваць
шлях ГОСПАДА, чыніць праведнасьць і суд, каб ГОСПАД зьдзейсьніў Абрагаму ўсё, што сказаў
яму».
20 І сказаў ГОСПАД: «Крык Садому і Гаморы вялікі, і грэх іхні вельмі цяжкі.
21 Дык зыйду і пагляджу, ці паводле крыку, які даходзіць да Мяне, учыняюць усё, ці не, і буду
[гэта] ведаць».
22 І павярнуліся тыя мужы, і пайшлі ў Садом, а Абрагам яшчэ стаяў перад абліччам ГОСПАДА.
23 І падыйшоў Абрагам, і сказаў: «Няўжо загубіш праведнага разам з бязбожным?
24 Можа, ёсьць у горадзе пяцьдзясят праведнікаў, няўжо Ты загубіш і не прабачыш гэтай
мясцовасьці дзеля пяцідзесяці праведнікаў, якія ў ім?
25 Няхай будзе далёкім ад Цябе, каб Ты ўчыніў такую справу, каб забіць праведнага з
бязбожным, каб праведнаму было таксама, як і бязбожнаму! Няхай будзе далёкім ад Цябе!
Ці ж Судзьдзя ўсёй зямлі ня ўчыніць правасудзьдзя?»
26 І сказаў ГОСПАД: «Калі знайду ў Садоме пяцьдзясят праведнікаў у горадзе, дзеля іх прабачу
ўсёй мясцовасьці».
27 І адказаў Абрагам, і сказаў: «Вось жа пачаў я гаварыць да Госпада майго, хоць я — пыл і
попел.
28 Можа, ня хопіць пяці да гэтых пяцідзесяці праведнікаў, няўжо дзеля нястачы пяці зьнішчыш
увесь горад?» І сказаў [Госпад]: «Ня зьнішчу, калі знайду там сорак пяць».
29 І працягваў гаварыць з Ім, і сказаў: «Можа, знойдзецца там сорак?» І Ён сказаў: «Не зраблю
гэтага дзеля сарака».
30 І сказаў ён: «Няхай ня гневаецца Госпад мой, і я буду гаварыць. Можа, знойдзецца там
трыццаць?» І Ён сказаў: «Не зраблю, калі знайду там трыццаць».
31 І сказаў ён: «Вось, я пачаў гаварыць да Госпада майго. Можа, знойдзецца там дваццаць?» І
Ён сказаў: «Ня зьнішчу дзеля дваццаці».
32 І сказаў ён: «Няхай ня гневаецца Госпад мой, і я буду гаварыць яшчэ раз. Можа, знойдзецца
там дзесяць?» І Ён сказаў: «Ня зьнішчу дзеля дзесяці».
33 І пайшоў ГОСПАД, скончыўшы гаварыць з Абрагамам, а Абрагам вярнуўся да месца свайго.

Бц 19

1 І прыйшлі два анёлы ў Садом увечары, а Лот сядзеў у браме Садома. І ён убачыў, і пайшоў

насустрач ім, і пакланіўся абліччам да зямлі,
2 і сказаў: «Вось, прашу, гаспадары мае, зьвярніце ў дом слугі вашага і пераначуйце, і памыйце
ногі свае, а раніцаю ўстанеце і пойдзеце ў дарогу сваю». А яны сказалі: «Не, бо мы будзем
начаваць на вуліцы».
3 Але ён іх вельмі ўпрошваў, і яны зьвярнулі да яго, і ўвайшлі ў дом ягоны. І ён справіў ім
гасьціну, і напёк праснакоў, і яны елі.
4 Яшчэ не ляглі яны спаць, як людзі з гораду, людзі Садомскія, ад малога да старога, увесь
народ з усіх канцоў, атачылі дом.
5 І паклікалі яны Лота, і сказалі яму: «Дзе тыя людзі, якія прыйшлі да цябе ноччу? Выведзі іх
да нас, і мы спазнаем іх».
6 І выйшаў да іх Лот да ўваходу, і замкнуў за сабою дзьверы,
7 і сказаў: «Прашу, браты мае, не рабіце ліхога.
8 Вось, маю дзьве дачкі, якія не спазналі мужа. Выведу іх да вас, і вы рабіце з імі, што добра ў
вачах вашых! Толькі людзям гэтым нічога не рабіце, бо яны прыйшлі ў цень даху майго».
9 Але яны сказалі: «Ідзі прэч». І сказалі: «Сам прыйшоў пажыць, і будзе судзіць, судзячы [нас]?
Цяпер будзе табе горш, чым ім». І накінуліся на чалавека гэтага, на Лота, і падыйшлі, каб
выламіць дзьверы.
10 І выцягнулі мужы тыя рукі свае, і ўцягнулі Лота да сябе ў дом, і замкнулі дзьверы.
11 А людзей, якія былі пры ўваходзе ў дом, ад найменшага да найбольшага, пакаралі
сьлепатою, і яны змучыліся, шукаючы выхаду.
12 І сказалі тыя мужы Лоту: «Ці хто яшчэ ёсьць тут у цябе? Зяця, сыноў тваіх і дачок тваіх, усіх,
хто ў цябе ёсць у горадзе, выведзі з гэтага месца,
13 бо мы зьнішчым гэтую мясцовасьць, таму што вялікі крык іхні перад абліччам ГОСПАДА, і
ГОСПАД паслаў нас зьнішчыць яе».
14 І выйшаў Лот, і гаварыў да зяцёў сваіх, якія мелі ўзяць дочак ягоных, і сказаў: «Уставайце,
выходзьце з гэтага месца, бо ГОСПАД мае зьнішчыць горад». І было ў вачах зяцёў ягоных гэта,
нібыта ён жартуе.
15 Калі ўзыйшла зараніца, анёлы прысьпешвалі Лота, кажучы: «Уставай, бяры жонку тваю і
дзьве дочкі твае, якія тут, каб не загінуў ты праз беззаконьні гораду гэтага».
16 А як ён марудзіў, схапілі тыя мужы за руку яго, і за руку жонку ягоную, і за руку абедзьвух
дачок ягоных, бо ГОСПАД меў спагаду да яго, і вывелі яго, і паставілі па-за горадам.
17 І сталася, калі вывелі іх вонкі, сказаў [адзін з іх]: «Уцякай дзеля душы тваёй, і не аглядайся
назад, і не затрымлівайся ў гэтай ваколіцы. Уцякай на гору, каб ты не загінуў!»
18 І сказаў Лот да іх: «О не, Госпадзе!
19 Вось жа, слуга Твой знайшоў ласку ў вачах Тваіх, і Ты павялічыў міласэрнасьць Тваю, якую
зьявіў для мяне, захоўваючы пры жыцьці душу маю. Але я не магу ўцячы на гору, каб не
напаткала мяне ліхое, і я не памёр.
20 Вось жа горад гэты блізка, каб бегчы туды, і ён малы. Дазволь уцячы мне туды, — ці ж не
малы ён, — і будзе жыць душа мая».
21 І сказаў яму: «Вось, Я прыняў аблічча тваё і ў гэтым слове, і ня зьнішчу горад, пра які ты
гаварыў.
22 Сьпяшайся, уцякай туды, бо Я не магу нічога рабіць, пакуль ты ня прыйдзеш туды». Таму і
названае імя гэтаму гораду Цаар.
23 Сонца ўзыйшло над зямлёю, і Лот увайшоў у Цаар.
24 І ГОСПАД лінуў на Садом і Гамору дождж серкі і агню ад ГОСПАДА з неба,
25 і зруйнаваў гарады гэтыя, і ўсю ваколіцу, і ўсіх жыхароў гарадоў гэтых, і расьліны зямлі.
26 І аглянулася жонка [Лота], ідучы за ім, і сталася слупом солі.
27 І ўстаў Абрагам раніцаю на тое месца, дзе стаяў перад абліччам ГОСПАДА,
28 і глянуў на аблічча Садома і Гаморы, і на аблічча ўсёй зямлі той ваколіцы, і ўбачыў, і вось,
дым падымаецца з зямлі, быццам з печы.

29 І сталася, калі Бог зьнішчыў гарады гэтай ваколіцы, узгадаў Бог пра Абрагама, і выслаў Лота
спаміж руйнаваньня, калі руйнаваў гарады, у якіх жыў Лот.
30 І падняўся Лот з Цаару, і жыў на гары, і дзьве дачкі ягоныя з ім, бо баяўся жыць у Цаары. І
жыў ён у пячоры, сам і дзьве дачкі ягоныя.
31 І сказала старэйшая малодшай: «Бацька наш стары, і няма мужчыны на зямлі, каб мог
прыйсьці да нас паводле звычаю ўсёй зямлі.
32 Хадзем, напоім бацьку нашага віном і ляжам з ім, каб ажывіць насеньне бацькі нашага».
33 І напаілі яны ў тую ноч бацьку свайго віном; і ўвайшла старэйшая, і ляжала з бацькам, а ён
ня ведаў, ані калі яна легла, ані калі ўстала.
34 І сталася на другі дзень, сказала старэйшая малодшай: «Вось, я ў мінулую ноч ляжала з
бацькам нашым. Напоім яго віном таксама ў гэтую ноч, і ты ўвойдзеш, і ляжаш з ім, і мы
ажывім насеньне бацькі нашага».
35 І напаілі яны таксама ў гэтую ноч бацьку свайго віном, і ўвайшла малодшая дачка, і ляжала
з ім, а ён ня ведаў, ані калі яна легла, ані калі ўстала.
36 І зачалі абедзьве дачкі Лота ад бацькі свайго.
37 І нарадзіла старэйшая сына, і назвала імя ягонае Мааў. Ён — бацька Мааву аж да сёньня.
38 І малодшая таксама нарадзіла сына, і назвала імя ягонае Бэн-Аммі. Ён — бацька сыноў
Амона аж да сёньня.

Бц 20

1 І рушыў адтуль Абрагам у зямлю Нэгеў, і пасяліўся між Кадэшам і Шурам, і жыў у Герары.
2 І сказаў Абрагам пра Сару, жонку сваю: «Яна — сястра мая». І паслаў Абімэлех, валадар
Герару, і ўзяў Сару.
3 І прыйшоў Бог да Абімэлеха ў сьне ўначы, і сказаў яму: «Вось, ты памрэш з прычыны
жанчыны, якую ты ўзяў, бо яна мае мужа».
4 А Абімэлех не набліжаўся да яе, і сказаў: «Госпадзе! Няўжо і народ праведны Ты заб'еш?
5 Ці ж ня ён сказаў мне: "Яна — сястра мая". І яна таксама казала: "Ён — брат мой". У прастаце
сэрца майго і ў чысьціні рук маіх учыніў я гэта».
6 І сказаў яму Бог у сьне: «І Я ведаю, што ў прастаце сэрца свайго ты ўчыніў гэта, і Я ўтрымаў
цябе, каб ты не саграшыў перада Мною; і Я ня даў табе дакрануцца да яе.
7 А цяпер вярні жонку гэтага мужа, бо ён — прарок, і ён будзе маліцца за цябе, і ты будзеш
жыць. А калі ня вернеш, ведай, што сьмерцю памрэш ты і ўсе, хто твае».
8 І ўстаў Абімэлех раніцай, і паклікаў усіх слугаў сваіх, і расказаў усе словы гэтыя ў вушы іхнія;
і моцна напалохаліся людзі гэтыя.
9 І паклікаў Абімэлех Абрагама, і сказаў яму: «Што ты нам нарабіў? Чым саграшыў я супраць
цябе, што ты навёў на мяне і на валадарства маё грэх вялікі? Учынкі, якія ня робяць, ты зрабіў
мне».
10 І сказаў Абімэлех Абрагаму: «Што ж ты думаў, калі рабіў гэтыя рэчы?»
11 І сказаў Абрагам: «Вось, я сказаў: "Напэўна, няма страху Божага на месцы гэтым, і заб'юць
мяне з прычыны жонкі маёй".
12 І, сапраўды, яна — сястра мая, яна — дачка бацькі майго, толькі не дачка маці маёй; і яна
стала маёй жонкаю.
13 І сталася, калі вывеў мяне Бог з дому бацькі майго, я сказаў ёй: "У тым міласэрнасьць твая,
якую ты можаш зрабіць для мяне: у кожным месцы, куды мы прыйдзем, кажы пра мяне: 'Ён
— брат мой' "».
14 І ўзяў Абімэлех авечак і валоў, і слугаў, і нявольніцаў, і даў Абрагаму, і вярнуў яму Сару,
жонку ягоную.
15 І сказаў Абімэлех: «Вось, зямля мая перад табою. Дзе добра ў вачах тваіх, жыві».
16 А Сары сказаў: «Вось, я даю тысячу срэбнікаў брату твайму. Няхай гэта будзе табе заслонаю
перад вачамі ўсіх, якія з табою, і перад усімі ты без віны».
17 І памаліўся Абрагам да Бога, і аздаравіў Бог Абімэлеха, і жонку ягоную, і нявольніцаў
ягоных, і яны нараджалі,

18 бо зачыніўшы, зачыніў ГОСПАД кожнае ўлоньне ў доме Абімэлеха з прычыны Сары, жонкі
Абрагама.

Бц 21

1 І ГОСПАД наведаў Сару, як сказаў; і ўчыніў ГОСПАД Сары, як гаварыў.
2 І зачала Сара, і нарадзіла сына Абрагаму ў старасьці ягонай, у час, пра які казаў яму Бог.
3 І назваў Абрагам сына свайго, які нарадзіўся яму, якога нарадзіла яму Сара, Ісаак.
4 І абрэзаў Абрагам Ісаака, сына свайго, на восьмы дзень, як загадаў яму Бог.
5 І было Абрагаму сто гадоў, калі нарадзіўся ў яго Ісаак, сын ягоны.
6 І сказала Сара: «Сьмех учыніў з мяне Бог. Кожны, хто пачуе, будзе сьмяяцца з мяне».
7 І сказала: «Хто сказаў бы Абрагаму: “Сара будзе карміць грудзьмі сыноў”, бо я нарадзіла
сына ў старасьці ягонай».
8 І вырасла дзіцятка, і было аднятае ад грудзей, і ўчыніў Абрагам вялікую гасьціну ў той дзень,
калі Ісаак быў адняты ад грудзей.
9 І ўбачыла Сара сына Агар Эгіпцянкі, якога тая нарадзіла Абрагаму, што ён насьміхаецца,
10 і сказала Абрагаму: «Выгані гэтую нявольніцу і сына ейнага, бо ня будзе мець спадчыну сын
нявольніцы гэтай з сынам маім Ісаакам».
11 І было гэта ліхім у вачах Абрагама адносна сына ягонага.
12 І сказаў Бог Абрагаму: «Няхай ня будзе гэта ліхім у вачах тваіх адносна хлопчыка і адносна
нявольніцы тваёй. У-ва ўсім, што скажа табе Сара, слухай голасу ейнага, бо ў Ісааку будзе
названа насеньне тваё.
13 Таксама сына нявольніцы Я зраблю народам, бо ён — насеньне тваё».
14 І ўстаў Абрагам раніцаю, і ўзяў хлеб і мех вады, і даў Агар, і палажыў ёй на плечы, і выслаў
яе разам з дзіцём. І яна пайшла, і блукала ў пустыні Бээр-Шэва.
15 І скончылася вада ў мяху, і яна пакінула дзіця пад адным з кустоў,
16 і пайшла, і села насупраць так далёка, як стрэліць з луку, бо яна сказала: «Няхай ня буду
глядзець на сьмерць дзіцяці». І сядзела насупраць, і ўзьняла голас свой, і плакала.
17 І пачуў Бог голас хлопчыка. І паклікаў анёл Божы да Агар з неба, і сказаў ёй: «Што з табою,
Агар? Ня бойся, бо пачуў Бог голас хлопчыка з месца, дзе Ён ёсьць.
18 Устань, падымі хлопца і трымай яго моцна рукою сваёю, бо Я зраблю яго народам вялікім».
19 І адчыніў Бог вочы ейныя, і яна ўбачыла студню з вадою, і пайшла, і напоўніла мех вады, і
дала піць хлопцу.
20 І быў Бог з хлопцам; і ён вырас, і жыў у пустыні, і быў стралец з луку.
21 І ён жыў у пустыні Паран; і ўзяла яму маці ягоная жонку з зямлі Эгіпецкай.
22 І сталася ў той час, і сказаў Абімэлех і Піколь, гетман ягоны, Абрагаму, кажучы: «Бог з табою
ў-ва ўсім, што ты робіш.
23 І цяпер прысягні мне Богам тут, што ты ня здрадзіш ані мне, ані нашчадку майму, ані ўнуку
майму, і як я чыніў міласэрнасьць табе, так ты будзеш рабіць са мною і з зямлёю, у якой ты
жывеш».
24 І сказаў Абрагам: «Прысягаю».
25 І дакараў Абрагам Абімэлеха з прычыны студні вады, якую забралі слугі Абімэлеха.
26 І сказаў Абімэлех: «Я ня ведаю, хто ўчыніў гэтую рэч, і ты не расказваў мне, і я ня чуў нічога
аж да сёньняшняга дня».
27 І ўзяў Абрагам авечак і валоў, і даў Абімэлеху, і заключылі яны абодва запавет.
28 І паставіў Абрагам сем ягнятаў з чарады асобна.
29 І сказаў Абімэлех Абрагаму: «Навошта гэтыя сем ягнятаў, якіх ты паставіў асобна?»
30 І сказаў [Абрагам]: «Бо сем гэтых ягнятаў возьмеш з рукі маёй, каб яны былі мне
сьведчаньнем, што я выкапаў гэтую студню».
31 Дзеля таго і названа гэтае месца Бээр-Шэва, бо там яны абодва прысягалі.
32 І заключылі запавет у Бээр-Шэве. І ўстаў Абімэлех і Піколь, гетман ягоны, і вярнуліся ў
зямлю Філістынскую.

33 І пасадзіў [Абрагам] гай у Бээр-Шэве, і клікаў там імя ГОСПАДА, Бога вечнага.
34 І жыў Абрагам у зямлі Філістынскай шмат дзён.

Бц 22

1 І сталася пасьля гэтых падзеяў, і Бог выспрабоўваў Абрагама, і сказаў яму: «Абрагаме!» І ён
сказаў: «Вось я!»
2 І сказаў [Бог]: «Вазьмі сына твайго, адзінага твайго, якога ты любіш, Ісаака; і ідзі ў зямлю
Морыя, і там складзі яго ў ахвяру цэласпаленьня на адной гары, пра якую Я скажу табе».
3 І ўстаў Абрагам рана раніцаю, і асядлаў асла свайго, узяў двух юнакоў сваіх з сабою і Ісаака,
сына свайго, і насек дроваў на цэласпаленьне, і ўстаў, і пайшоў на месца, пра якое сказаў яму
Бог.
4 На трэці дзень узьняў Абрагам вочы свае і ўбачыў тое месца здалёк.
5 І сказаў Абрагам юнакам сваім: «Застаньцеся тут з аслом, а мы з хлопцам пойдзем аж туды,
і паклонімся, і вернемся да вас».
6 І ўзяў Абрагам дровы на цэласпаленьне, і ўзлажыў на Ісаака, сына свайго; і ўзяў у рукі агонь
і вялікі нож, і пайшлі абодва разам.
7 І сказаў Ісаак Абрагаму, бацьку свайму: «Ойча мой!» Той сказаў: «Вось я, сыне мой». Ён
сказаў: «Вось агонь і дровы, а дзе ягня на цэласпаленьне?»
8 І сказаў Абрагам: «Бог угледзіць Сабе ягня на цэласпаленьне, сыне мой». І ішлі абодва разам.
9 І прыйшлі на месца, пра якое казаў яму Бог; і збудаваў там Абрагам ахвярнік, і разлажыў
дровы, і зьвязаў Ісаака, сына свайго, і палажыў яго на ахвярнік зьверху на дровы.
10 І выцягнуў Абрагам руку сваю, і ўзяў вялікі нож, каб закалоць сына свайго.
11 І паклікаў яго анёл ГОСПАДА з неба, і сказаў: «Абрагаме! Абрагаме!» Той сказаў: «Вось я!»
12 І сказаў [Госпад]: «Не выцягвай рукі сваёй на хлопца і не рабі яму нічога, бо цяпер Я ведаю,
што ты баішся Бога і не пашкадаваў дзеля Мяне сына твайго, адзінага твайго».
13 І ўзьняў Абрагам вочы свае, і ўбачыў, і вось, баран ззаду, увязаны ў хмызах рагамі сваімі. І
пайшоў Абрагам, і ўзяў барана, і ахвяраваў яго на цэласпаленьне замест сына свайго.
14 І назваў Абрагам імя месца гэтага: «ГОСПАД угледзіць». Дзеля гэтага і цяпер кажуць: «На
гары ГОСПАД дасьць угледзець».
15 І паклікаў анёл ГОСПАДА Абрагама другі раз з неба,
16 і сказаў: «На Сябе Самога прысягаю, кажа ГОСПАД, за тое, што ты гэта зрабіў, і не пашкадаваў
сына твайго, адзінага твайго,
17 дабраслаўляючы, дабраслаўлю цябе і, памнажаючы, памножу насеньне тваё, як зоркі
нябесныя і як пясок на беразе мора; і ўспадкаеміць насеньне тваё брамы ворагаў сваіх.
18 І будуць дабраслаўлёныя ў насеньні тваім усе народы зямлі за тое, што ты паслухаў голасу
Майго».
19 І вярнуўся Абрагам да юнакоў сваіх, і ўсталі, і пайшлі разам да Бээр-Шэвы. І жыў Абрагам у
Бээр-Шэве.
20 І сталася пасьля гэтых падзеяў, паведамілі Абрагаму, кажучы: «Вось, нарадзіла таксама
Мілька сыноў Нахору, брату твайму:
21 Уца, першароднага ягонага, і Буза, брата ягонага, і Кемуэля, бацьку Арама,
22 і Кесэда, і Хазо, і Пільдаша, і Ідлафа, і Бэтуэля».
23 А Бэтуэль нарадзіў Рэбэку. Васьмёх гэтых нарадзіла Мілька Нахору, брату Абрагама.
24 І наложніца ягоная, імя якой Рэўма, нарадзіла таксама Тэваха, і Гахама, і Тахаша, і Маху.

Бц 23

1 І было жыцьця Сары сто дваццаць сем гадоў, [гэта] гады жыцьця Сары.
2 І памерла Сара ў Кірыят-Арбе, гэта значыць, у Хеўроне, у зямлі Ханаан. І прыйшоў Абрагам,
каб мець жалобу па Сары і плакаць па ёй.
3 І ўстаў Абрагам ад аблічча памёршай сваёй, і прамовіў да сыноў Хета, кажучы:

4 «Прыхадзень і пасяленец я ў вас. Дайце мне ў вас на ўласнасьць магілу, і я пахаваю ад аблічча
майго памёршую маю».
5 І адказалі сыны Хета Абрагаму, кажучы яму:
6 «Паслухай нас, пане мой! Князь Божы ты сярод нас; у найлепшай з нашых магілаў пахавай
памёршую сваю. Ніхто з нас не адмовіць табе магілы сваёй на пахаваньне памёршай тваёй».
7 І ўстаў Абрагам, і пакланіўся народу зямлі, сынам Хета,
8 і прамовіў да іх, кажучы: «Калі жадае душа вашая, каб я пахаваў ад аблічча майго памёршую
маю, паслухайце мяне і папрасіце за мяне Эфрона, сына Цахара,
9 і ён дасьць мне пячору Махпэля, што ў яго, якая на канцы поля ягонага, за поўнае срэбра
дасьць мне яе, каб меў я сярод вас магілу на ўласнасьць».
10 А Эфрон сядзеў сярод сыноў Хета. І адказаў Эфрон Хет Абрагаму ўслых усіх сыноў Хета, якія
ўваходзілі ў брамы гораду ягонага, кажучы:
11 «Не, пане мой! Паслухай мяне: поле я даю табе, і пячору, якая на ім, я даю табе, перад
вачыма сыноў народу майго даю табе яе, пахавай памёршую тваю».
12 І пакланіўся Абрагам перад народам зямлі,
13 і сказаў Эфрону ўслых народу зямлі, кажучы: «Калі б ты толькі паслухаў мяне, я даю табе
срэбра за поле гэтае; вазьмі ў мяне, і я пахаваю там памёршую маю».
14 І адказаў Эфрон Абрагаму, кажучы яму:
15 «Пане мой, паслухай мяне! Зямля [вартая] чатырыста сыкляў срэбра. Што гэта для мяне і
для цябе? І пахавай памёршую тваю».
16 І паслухаў Абрагам Эфрона; і адважыў Абрагам Эфрону срэбра, пра якое ён казаў услых
сыноў Хета, чатырыста сыкляў срэбра, якое ўжывалася ў купцоў.
17 І атрымаў поле Эфрона, якое ў Махпэлі, што насупраць Мамрэ, поле тое і пячору, якая на
ім, і ўсе дрэвы, якія на полі, у-ва ўсіх межах ягоных наўкола.
18 Абрагам купіў яго перад вачыма сыноў Хета, усіх, якія ўваходзілі ў брамы гораду ягонага.
19 І пасьля гэтага Абрагам пахаваў Сару, жонку сваю, у пячоры на полі ў Махпэлі, насупраць
Мамрэ, якое завецца Хеўрон, у зямлі Ханаан.
20 І атрымаў Абрагам тое поле і тую пячору, якая на ім, як магілу на ўласнасьць ад сыноў Хета.

Бц 24

1 І Абрагам быў стары, і меў шмат дзён, і ГОСПАД дабраславіў Абрагама ў-ва ўсім.
2 І сказаў Абрагам слузе свайму, старэйшаму ў доме сваім, які меў уладу над усім, што ў яго
было: «Палажы руку сваю пад сьцягно маё,
3 і я прывяду цябе да прысягі на ГОСПАДА, Бога неба і Бога зямлі, што ты ня возьмеш жонкі
сыну майму з дачок Хананейскіх, сярод якіх я жыву,
4 але пойдзеш у зямлю маю і да родзічаў маіх, і возьмеш жонку сыну майму Ісааку».
5 І сказаў яму слуга: «Можа, не пажадае тая жанчына ісьці са мною сюды, у гэтую зямлю. Ці
маю я завесьці сына твайго адсюль у тую зямлю, з якой ты выйшаў?»
6 І сказаў яму Абрагам: «Сьцеражыся, каб не завесьці туды сына майго.
7 ГОСПАД, Бог неба, Які ўзяў мяне з дому бацькі майго і з зямлі нараджэньня майго, і Які казаў
да мяне, і Які прысягнуў мне, кажучы: “Насеньню твайму Я дам гэтую зямлю”, — Ён пашле
анёла Свайго перад абліччам тваім, і ты возьмеш адтуль жонку сыну майму.
8 А калі не пажадае тая жанчына ісьці з табою, ты будзеш вызвалены ад гэтае прысягі маёй;
толькі сына майго не завядзі туды».
9 І палажыў слуга руку сваю пад сьцягно Абрагама, пана свайго, і прысягнуў яму ў гэтай
справе.
10 І ўзяў той слуга дзесяць вярблюдаў пана свайго, і пайшоў, і ўсялякае даброцьце пана ягонага
[было] ў руцэ ягонай. І ўстаў ён, і пайшоў у Арам-Нагараім, у горад Нахора.
11 І дазволіў ён вярблюдам укленчыць вонкі гораду каля студні вады пад вечар, у той час, калі
выходзяць чэрпаць ваду.

12 І сказаў ён: «ГОСПАДЗЕ, Божа пана майго Абрагама! Зрабі, каб сталася [ласка] мне сёньня,
і ўчыні міласэрнасьць пану майму Абрагаму.
13 Вось, я стаю каля крыніцы вады, і дочкі жыхароў гораду выходзяць чэрпаць ваду.
14 Няхай станецца, што тая дзяўчына, якой я скажу: “Нахілі збан свой, і я нап’юся”, і якая
скажа: “Пі, я і вярблюдаў тваіх напаю”, вось гэта тая, якую Ты прызначыў слузе Твайму Ісааку,
і з гэтага пазнаю, што Ты ўчыніў міласэрнасьць пану майму».
15 І сталася, перш, чым скончыў ён казаць, вось, выйшла Рэбэка, якая нарадзілася ў Бэтуэля,
сына Мількі, жонкі Нахора, брата Абрагама, і збан ейны на плячы ў яе.
16 І [была] тая дзяўчына вельмі прыгожая з выгляду, дзяўчына, якую мужчына не пазнаў. І
зыйшла яна да крыніцы, і напоўніла збан, і вярталася.
17 І пабег слуга насустрач ёй, і сказаў: «Дай мне глытнуць крыху вады са збана твайго».
18 І сказала яна: «Пі, пане мой». І пасьпяшалася, і спусьціла збан на руку сваю, і дала яму
напіцца.
19 І скончыла яна даваць яму піць, і сказала: «Таксама для вярблюдаў тваіх я буду чэрпаць,
пакуль не нап’юцца».
20 І пасьпяшалася, і выліла збан свой у карыта, і пабегла зноў да студні чэрпаць, і чэрпала для
ўсіх вярблюдаў ягоных.
21 І чалавек той моўчкі ўглядаўся на яе, каб спазнаць, ці даў ГОСПАД посьпех на шляху ягоным,
ці не.
22 І сталася, як вярблюды напіліся, узяў чалавек той залатое колца ў паўсыкля вагою і два
бранзалеты на рукі ейныя, вага якіх дзесяць сыкляў золата,
23 і сказаў: «Чыя ты дачка? Скажы мне. Ці ёсьць у доме бацькі твайго месца для нас, каб
начаваць?»
24 І яна сказала яму: «Я — дачка Бэтуэля, сына Мількі, якога яна нарадзіла Нахору».
25 І сказала яму: «Таксама саломы і корму шмат у нас, а таксама месца, каб начаваць».
26 І схіліўся чалавек той, і пакланіўся ГОСПАДУ,
27 і сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог пана майго Абрагама, Які не ўхіліў міласэрнасьці
Сваёй і вернасьці Сваёй ад пана майго! Я — на шляху, якім прывёў мяне ГОСПАД да дому брата
пана майго».
28 І пабегла дзяўчына, і расказала дома маці сваёй пра тое, што здарылася.
29 А ў Рэбэкі [быў] брат, імя ягонае — Ляван. І пабег Ляван вонкі да таго чалавека да крыніцы.
30 І сталася, калі ўбачыў ён колца і бранзалеты на руках у сястры сваёй і пачуў словы Рэбэкі,
сястры сваёй, якая сказала: «Гэтак гаварыў са мною чалавек той», дык прыйшоў да чалавека
таго, і вось, ён стаіць пры вярблюдах каля крыніцы.
31 І сказаў [Ляван]: «Увайдзі, дабраслаўлёны ГОСПАДАМ. Чаму ты стаіш на двары? Я
падрыхтаваў дом і месца для вярблюдаў».
32 І ўвайшоў чалавек той у дом. І [Ляван] расьсядлаў вярблюдаў, і даў саломы і корму для
вярблюдаў, і вады, каб памыць ногі ягоныя і ногі людзей, якія з ім.
33 І паставілі перад ім есьці; а ён сказаў: «Ня буду есьці, пакуль не скажу словы свае». І сказаў
[Ляван]: «Кажы!»
34 І ён сказаў: «Я — слуга Абрагама.
35 І ГОСПАД вельмі дабраславіў пана майго, і ён стаў вялікі. І Ён даў яму авечак і валоў, і срэбра,
і золата, і слугаў, і нявольніцаў, і вярблюдаў, і аслоў.
36 І нарадзіла Сара, жонка пана майго, сына пану майму пасьля, у старасьці сваёй, і ён аддаў
яму ўсё, што ў яго.
37 І ўзяў з мяне прысягу пан мой, кажучы: “Не бяры жонкі сыну майму з дачок Хананейскіх,
сярод якіх я жыву, у зямлі іхняй,
38 але пойдзеш у дом бацькі майго і да сям’і маёй, і возьмеш жонку сыну майму”.
39 І сказаў я пану майму: “Можа, ня пойдзе жанчына тая са мною”.
40 І сказаў ён мне: “ГОСПАД, перад абліччам Якога я хадзіў, пашле анёла Свайго з табою і дасьць
посьпех на шляху тваім, і ты возьмеш жонку сыну майму з сям’і маёй і з дому бацькі майго.

41 Тады будзеш ты вызвалены ад прысягі маёй, калі прыйдзеш да сям'і маёй, і калі яны не
дадуць табе, ты будзеш вызвалены ад прысягі!"
42 І прыйшоў я сёньня да крыніцы, і сказаў: "ГОСПАДЗЕ, Божа пана майго Абрагама! Калі ёсьць
воля Твая, дай посьпех на шляху маім, па якім іду.
43 Вось, я стаю каля крыніцы вады, і няхай будзе, што тая дзяўчына, якая выйдзе чэрпаць, і я
скажу ёй: "Дай мне напіцца крыху вады са збана твайго",
44 а яна скажа мне: "І ты пі, і я таксама для вярблюдаў начэрпаю", яна [будзе] тою жанчынаю,
якую прызначыў ГОСПАД сыну пана майго".
45 Перш чым скончыў я гаварыць у сэрцы сваім, вось, Рэбэка выйшла, і збан ейны на плячы ў
яе. І зыйшла яна да крыніцы, і начэрпала; і я сказаў ёй: "Дай мне напіцца!"
46 І яна пасьпяшалася, і спусьціла збан з сябе, і сказала: "Пі, і таксама вярблюдаў тваіх я
напаю". І я піў, і вярблюдаў яна напаіла.
47 І я запытаўся ў яе і сказаў: "Чыя ты дачка?" Яна сказала: "Дачка Бэтуэля, сына Нахора, якога
нарадзіла яму Мілька". І надзеў я колца ў нос ейны, і бранзалеты на рукі ейныя.
48 І я схіліўся, і пакланіўся ГОСПАДУ, і дабраславіў ГОСПАДА, Бога пана майго Абрагама, Які
прывёў мяне шляхам праўды, каб узяў я дачку брата пана майго для сына ягонага.
49 І калі вы жадаеце ўчыніць міласэрнасьць і вернасьць пану майму, скажыце мне, а калі не,
скажыце мне, і я павярну направа альбо налева».
50 І адказалі Ляван і Бэтуэль, і сказалі: «Ад ГОСПАДА выйшла слова гэтае, мы ня можам казаць
табе ані ліхога, ані добрага.
51 Вось, Рэбэка перад абліччам тваім, вазьмі і пайдзі, і няхай будзе яна жонкаю сыну пана
твайго, як казаў ГОСПАД».
52 І сталася, калі пачуў слуга Абрагама словы іхныя, пакланіўся да зямлі ГОСПАДУ.
53 І выняў слуга рэчы срэбныя, і рэчы залатыя, і шаты, і даў Рэбэцы; і каштоўныя рэчы даў
брату ейнаму і маці ейнай.
54 І елі, і пілі ён і людзі, якія з ім, і пераначавалі. І ўсталі раніцаю, і ён сказаў: «Адпусьціце
мяне да пана майго».
55 І сказаў брат ейны і маці ейная: «Няхай застанецца з намі дзяўчына на дзён дзесяць, потым
пойдзе».
56 І ён сказаў ім: «Не затрымлівайце мяне. ГОСПАД даў посьпех на шляху маім, адпусьціце
мяне, і я пайду да пана майго».
57 І яны сказалі: «Паклічам дзяўчыну і спытаемся ў яе».
58 І паклікалі Рэбэку, і сказалі ёй: «Ці пойдзеш з гэтым чалавекам?» Яна сказала: «Пайду!»
59 І адпусьцілі Рэбэку, сястру сваю, і няньку ейную, і слугу Абрагама, і людзей ягоных.
60 І дабраславілі Рэбэку, і сказалі ёй: «Сястра наша, ты стань тысячай тысячаў, і няхай
насеньне тваё ўспадкаеміць брамы ворагаў сваіх!»
61 І ўстала Рэбэка і служкі ейныя, і селі на вярблюдаў, і пайшлі за тым чалавекам. І ўзяў слуга
Рэбэку, і пайшоў.
62 І прыйшоў Ісаак з [дарогі] ад Бээр-Ляхай-Рой, а ён жыў у зямлі Нэгеў.
63 І выйшаў Ісаак падумаць у поле пад вечар, і ўзьняў вочы свае, і ўбачыў, і вось, вярблюды
прыходзяць.
64 І ўзьняла Рэбэка вочы свае, і ўбачыла Ісаака, і сьсела з вярблюда.
65 І сказала слузе: «Хто гэты чалавек, які ідзе па полі насустрач нам?» І сказаў слуга: «Гэта
пан мой». І яна ўзяла вэлюм, і засланілася.
66 І распавёў слуга Ісааку ўсе справы, якія ён зрабіў.
67 І ўвёў яе Ісаак у намёт Сары, маці сваёй, і ўзяў Рэбэку, і яна стала яму жонкаю, і ён кахаў яе.
І суцешыўся Ісаак па маці сваёй.

Бц 25

1 І зноў узяў Абрагам жонку, а імя ейнае — Кетура.
2 І нарадзіла яна яму Зімрана, і Ёкшана, і Мэдана, і Мадыяна, і Ішбака, і Шуаха.

3 А Ёкшан нарадзіў Шэву і Дэдана. Сынамі Дэдана былі Ашурым, і Летушым, і Леўмім.
4 А сынамі Мадыяна — Эфа, і Эфэр, і Ханох, і Авіда, і Эльдаа. Усе яны — сыны Кетуры.
5 І аддаў Абрагам усё, што было ў яго, Ісааку.
6 А сынам наложніцаў, якія былі ў Абрагама, даў Абрагам дары, і адаслаў іх ад Ісаака, сына свайго, яшчэ за жыцьця свайго, на ўсход, у зямлю ўсходнюю.
7 І вось дні гадоў жыцьця Абрагама, якія ён пражыў — сто семдзясят пяць гадоў.
8 І супачыў, і памёр Абрагам у старасьці добрай, стары і насычаны [жыцьцём], і быў далучаны да народу свайго.
9 І пахавалі яго Ісаак і Ізмаэль, сыны ягоныя, у пячоры Махпэля, што насупраць Мамрэ, на полі Эфрона Хета, сына Цахара.
10 Гэта тое поле, якое купіў Абрагам у сыноў Хета. Там пахаваныя Абрагам і Сара, жонка ягоная.
11 І сталася пасьля сьмерці Абрагама, дабраславіў Бог Ісаака, сына ягонага, і жыў Ісаак каля Бэер-Ляхай-Рой.
12 Вось радавод Ізмаэля, сына Абрагама, якога нарадзіла Абрагаму Агар Эгіпцянка, нявольніца Сары.
13 І вось імёны сыноў Ізмаэля, паводле імёнаў іхніх, паводле родаў іхніх: першародны Ізмаэля Наваёт, Кедар, Адбээль, Міўсам,
14 Мішма, Дума, Маса,
15 Хадад, Тэма, Етур, Нафіш і Кедма.
16 Гэта сыны Ізмаэля, і гэта імёны іхнія ў паселішчах іхніх і ў табарах іхніх, дванаццаць князёў плямёнаў сваіх.
17 А гадоў жыцьця Ізмаэля — сто трыццаць сем гадоў. І ён супачыў, і памёр, і быў далучаны да народу свайго.
18 І жылі яны ад Хавілі да Шура, які насупраць Эгіпту, калі ідзеш у Асірыю. Перад абліччам усіх братоў сваіх пасяліўся ён.
19 А гэта радавод Ісаака, сына Абрагама. Абрагам нарадзіў Ісаака.
20 І было Ісааку сорак гадоў, калі ён узяў Рэбэку, дачку Бэтуэля Арамейца з Падан-Араму, сястру Лявана Арамейца, сабе за жонку.
21 І прасіў Ісаак ГОСПАДА пра жонку сваю, бо яна была бясплодная; і ГОСПАД быў упрошаны ім, і зачала Рэбэка, жонка ягоная.
22 І штурхаліся сыны ў нутры ейным, і яна сказала: «Калі так, дык чаму ў мяне?» І пайшла спытацца ў ГОСПАДА.
23 І сказаў ГОСПАД ёй: «Два народы ў жываце тваім, і два народы выйдуць з нутра твайго; і адзін народ будзе мацнейшым за другі, і старэйшы будзе служыць малодшаму».
24 І споўніліся дні ейныя, каб нарадзіць, і вось, двайняты ў жываце ейным.
25 І выйшаў першы, чырвоны, увесь, як кажух, касматы; і назвалі імя ягонае Эзаў.
26 Потым выйшаў брат ягоны, і рука ягоная трымала пяту Эзава, і назвалі імя ягонае Якуб. А Ісааку было шэсьцьдзясят гадоў, калі яны нарадзіліся.
27 І вырасьлі хлопчыкі, і быў Эзаў спрытным паляўнічым, чалавекам поля, а Якуб быў чалавекам рахманым, які жыў у намётах.
28 І любіў Ісаак Эзава, бо ўпаляванае ім [было] ў вуснах ягоных; а Рэбэка любіла Якуба.
29 І варыў Якуб страву, і Эзаў прыйшоў з поля, і быў ён стомлены.
30 І сказаў Эзаў Якубу: «Дай мне крыху чырвонай, гэтай чырвонай [стравы], бо я стомлены». Дзеля гэтага названае імя ягонае Эдом.
31 І сказаў Якуб: «Прадай мне сёньня першародзтва тваё».
32 І сказаў Эзаў: «Вось, я ледзь не паміраю, і на што мне гэта першародзтва?»
33 І сказаў Якуб: «Прысягні мне сёньня». І той прысягнуў яму, і прадаў першародзтва сваё Якубу.
34 І Якуб даў Эзаву хлеб і страву з сачэвіцы, і ён еў, і піў, і ўстаў, і пайшоў; і пагрэбаваў Эзаў першародзтвам.

Бц 26

1 І быў голад у зямлі той, ня лічачы першага голаду, які быў у дні Абрагама. І пайшоў Ісаак да
Абімэлеха, валадара Філістынскага, у Герар.
2 І зьявіўся яму ГОСПАД, і сказаў: «Не зыходзь у Эгіпет; жыві ў зямлі, пра якую скажу табе.
3 Жыві ў зямлі гэтай; і Я буду з табою, і дабраслаўлю цябе, бо табе і насеньню твайму Я дам усе
краіны гэтыя, і споўню прысягу, якой Я прысягаў Абрагаму, бацьку твайму.
4 І памножу насеньне тваё, як зоркі ў небе, і дам насеньню твайму ўсе краіны гэтыя; і
дабраславяцца ў насеньні тваім усе народы зямлі,
5 таму што Абрагам паслухаў голасу Майго і захоўваў загады Мае, прыказаньні Мае, пастановы
Мае і законы Мае».
6 І пасяліўся Ісаак у Герары.
7 І пыталіся людзі месца таго пра жонку ягоную, і ён сказаў: «Яна — сястра мая», бо баяўся
сказаць: «Жонка мая», каб не забілі яго людзі месца таго за Рэбэку, бо яна была прыгожая з
выгляду.
8 І сталася, калі доўгія былі там дні ягоныя, глянуў Абімэлех, валадар Філістынскі, праз вакно,
і ўбачыў, а вось, Ісаак гуляе з Рэбэкаю, жонкаю сваёю.
9 І паклікаў Абімэлех Ісаака, і сказаў: «Дык яна — жонка твая! А чаму ж ты казаў: “Яна —
сястра мая”?» І сказаў яму Ісаак: «Бо я сказаў: “Каб я не памёр праз яе”».
10 І сказаў Абімэлех: «Што гэта ты нарабіў нам? Яшчэ б трохі, і мог бы легчы нехта з народу з
жонкаю тваёю, і ты прывёў бы на нас віну».
11 І загадаў Абімэлех усяму народу, кажучы: «Хто дакранецца да гэтага чалавека і да жонкі
ягонай, той сьмерцю памрэ».
12 І сеяў Ісаак у зямлі той, і сабраў у той год стакротны ўраджай, і дабраславіў яго ГОСПАД.
13 І ставаўся вялікім муж гэты, і ішоў угору, і павялічыўся так, што стаў вельмі вялікі.
14 І былі ў яго статкі авечак, і статкі валоў, і мноства слугаў, і зайздросьцілі яму Філістынцы.
15 І ўсе студні, якія выкапалі слугі бацькі ягонага ў дні Абрагама, бацькі ягонага, засыпалі
Філістынцы і запоўнілі пяском.
16 І сказаў Абімэлех Ісааку: «Адыйдзі ад нас, бо ты стаўся шмат дужэйшы за нас».
17 І адыйшоў адтуль Ісаак, і паставіў [намёты] каля ручая Герарскага, і жыў там.
18 І вярнуўся Ісаак, і адкапаў студні вады, якія былі выкапаныя ў дні Абрагама, бацькі ягонага,
і якія засыпалі Філістынцы пасьля сьмерці Абрагама, і назваў іх тымі самымі назвамі, якімі
назваў іх бацька ягоны.
19 І капалі слугі Ісаака каля ручая, і знайшлі там студню вады жывой.
20 І спрачаліся пастухі Герарскія з пастухамі Ісаака, кажучы: «Гэта наша вада», і ён назваў імя
студні Эсэк, бо вадзіліся з ім.
21 І выкапалі другую студню; і спрачаліся таксама за яе; і ён назваў яе імя Сітна.
22 І выбраўся адтуль, і выкапаў іншую студню, і не спрачаліся за яе; і назваў яе імя Рэхавот, і
сказаў: «Бо цяпер пашырыў нас ГОСПАД, і мы будзем памнажацца ў гэтай зямлі».
23 Адтуль узыйшоў ён у Бээр-Шэву.
24 І зьявіўся яму ГОСПАД у тую ноч, і сказаў: «Я — Бог Абрагама, бацькі твайго. Ня бойся, бо Я
з табою; і дабраслаўлю цябе, і памножу насеньне тваё дзеля Абрагама, слугі Майго».
25 І ён збудаваў там ахвярнік, і клікаў імя ГОСПАДА. І паставіў там намёт свой, і выкапалі там
слугі Ісаака студню.
26 І Абімэлех прыйшоў да яго з Герару, і Ахузат, сябра ягоны, і Піколь, гетман ягоны.
27 І сказаў ім Ісаак: «Чаму вы прыйшлі да мяне? Вы ж зьненавідзелі мяне і выслалі мяне ад
сябе».
28 І яны сказалі: «Мы, гледзячы, убачылі, што ГОСПАД з табою, і мы сказалі: “Няхай будзе
прысяга паміж намі, паміж намі і табою, і мы заключым запавет з табою,
29 і ты ня будзеш рабіць нам ліха, як і мы не дакрануліся цябе, і як мы рабілі табе адно дабро і
адпусьцілі цябе ў супакоі, і ты цяпер дабраслаўлёны ГОСПАДАМ”».
30 І ён зрабіў для іх гасьціну, і яны елі і пілі.

31 І ўсталі раніцаю, і прысягнулі адзін аднаму; і адпусьціў іх Ісаак, і яны пайшлі ад яго ў супакоі.
32 І сталася ў той дзень, прыйшлі слугі Ісаака, і паведамілі яму пра студню, якую яны выкапалі,
і сказалі яму: «Мы знайшлі ваду!»
33 І ён назваў яе Шыва. Дзеля гэтага імя гораду таго Бээр-Шэва аж да сёньняшняга дня.
34 І сталася, што меў Эзаў сорак гадоў, і ўзяў сабе за жонку Юдыту, дачку Бээры Хета, і Басэмат,
дачку Элёна Хета,
35 і былі яны горыччу для духа Ісаака і Рэбэкі.

Бц 27

1 І сталася, што Ісаак састарэў, і зацемрыліся вочы ягоныя, так што ня мог бачыць, і паклікаў
ён Эзава, сына свайго старэйшага, і сказаў яму: «Сыне мой». І той сказаў яму: «Вось я».
2 І ён сказаў: «Вось, я састарэў, ня ведаю дня сьмерці маёй.
3 І цяпер вазьмі прылады твае, сагайдак твой і лук твой, і пайдзі ў поле, і ўпалюй мне дзічыны,
4 і зрабі мне прысмакі, якія я люблю, і прынясі мне, і я паем, каб дабраславіла цябе душа мая
раней, чым я памру».
5 А Рэбэка чула, як Ісаак казаў Эзаву, сыну свайму. І пайшоў Эзаў у поле, каб упаляваць
дзічыны і прынесьці яе.
6 І сказала Рэбэка Якубу, сыну свайму, кажучы: «Вось, я чула бацьку твайго, як ён казаў брату
твайму Эзаву, кажучы:
7 “Прынясі мне дзічыны і зрабі мне прысмакі, і я буду есьці, і дабраслаўлю цябе перад абліччам
ГОСПАДА, перад сьмерцю сваёй”.
8 І цяпер, сыне мой, паслухай голасу майго ў тым, што я загадваю табе.
9 Пайдзі да авечак і вазьмі мне адтуль двух казьлянят добрых; і я прыгатую з іх прысмакі для
бацькі твайго, якія ён любіць.
10 І ты прынясеш іх бацьку твайму, і ён зьесьць, каб ён дабраславіў цябе перад сьмерцю сваёю».
11 І сказаў Якуб Рэбэцы, маці сваёй: «Вось жа Эзаў, брат мой, чалавек касматы, а я — чалавек
гладкі.
12 Можа, памацае мяне бацька мой, і я буду ў вачах ягоных як той, які ашуквае яго, і навяду на
сябе праклён, а не дабраславеньне».
13 І сказала яму маці ягоная: «На мне [будзе] праклён твой, сыне мой, толькі паслухай голасу
майго і ідзі, і вазьмі для мяне [казьлянят]».
14 І ён пайшоў, і ўзяў, і прынёс маці сваёй, і зрабіла маці ягоная прысмакі, якія любіў бацька
ягоны.
15 І ўзяла Рэбэка адзежу Эзава, сына свайго старэйшага, найкаштоўнейшую, што была ў яе
дома, і апранула Якуба, сына свайго малодшага,
16 і скуркамі казьлянят абкруціла рукі ягоныя і гладкую шыю ягоную,
17 і дала прысмакі і хлеб, які яна зрабіла, у рукі Якуба, сына свайго.
18 І ўвайшоў ён да бацькі свайго, і сказаў: «Ойча мой!» І сказаў ён: «Вось я. Хто ты, сыне мой?»
19 І сказаў Якуб бацьку свайму: «Я — Эзаў, першародны твой. Я зрабіў, як ты сказаў мне.
Устань, сядзь і еш дзічыну маю, каб дабраславіла мяне душа твая».
20 І сказаў Ісаак сыну свайму: «Як гэта так хутка ты знайшоў яе, сыне мой». А той сказаў: «Бо
справіў гэта ГОСПАД, Бог твой, перад абліччам маім».
21 І сказаў Ісаак Якубу: «Наблізься, я памацаю цябе, сыне мой, ці ты — сын мой Эзаў, ці не».
22 І наблізіўся Якуб да Ісаака, бацькі свайго, і ён памацаў яго, і сказаў: «Голас — голас Якуба,
але рукі — рукі Эзава».
23 І не пазнаў яго, бо рукі ягоныя былі як рукі брата ягонага, касматыя, і дабраславіў яго.
24 І сказаў: «Ці ты — сын мой Эзаў?» І ён сказаў: «Я».
25 І сказаў: «Дай мне, і я буду есьці дзічыну, сыне мой, каб дабраславіла цябе душа мая». І ён
даў яму, і ён еў; і прынёс яму віна, і ён піў.
26 І сказаў яму Ісаак, бацька ягоны: «Наблізься і пацалуй мяне, сыне мой».

27 І ён наблізіўся, і пацалаваў яго. І адчуў ён пах адзежы ягонай, і дабраславіў яго, і сказаў:
«Вось, пах сына майго, як пах поля, якое дабраславіў ГОСПАД.
28 І няхай дасьць табе Бог расу з неба і тлустасьць з зямлі, і мноства збожжа і віна.
29 Няхай служаць табе народы, і няхай кланяюцца табе плямёны. Будзь гаспадаром над
братамі тваімі, і няхай кланяюцца табе сыны маці тваёй. Хто праклінае цябе, будзе пракляты,
а хто дабраслаўляе цябе, будзе дабраслаўлёны».
30 І сталася, калі скончыў Ісаак дабраслаўляць Якуба, і вось, адыходзячы, адыйшоў Якуб ад
аблічча Ісаака, бацькі свайго, Эзаў, брат ягоны, прыйшоў з паляваньня свайго.
31 І зрабіў ён таксама прысмакі, і прынёс бацьку свайму, і сказаў бацьку свайму: «Устань, ойча
мой, і зьеш дзічыну сына свайго, каб дабраславіла мяне душа твая».
32 І сказаў яму Ісаак, бацька ягоны: «Хто ты?» І ён сказаў: «Я — сын твой першародны Эзаў».
33 І задрыжэў Ісаак дрыжэньнем вельмі вялікім, і сказаў: «Хто ж быў той, які ўпаляваў дзічыну
і прынёс мне, і я еў усё перш, чым ты прыйшоў, і я дабраславіў яго? Ён будзе дабраслаўлёны».
34 Калі пачуў Эзаў словы бацькі свайго, закрычаў крыкам вялікім і надта горкім, і сказаў бацьку
свайму: «Дабраславі мяне, таксама і мяне, ойча мой!»
35 І сказаў той: «Брат твой прыйшоў падступна і ўзяў дабраславеньне тваё».
36 І сказаў ён: «Ці не таму названае імя ягонае Якуб, і вось, ашукаў мяне ўжо двойчы! Ён забраў
першародзтва маё, і вось цяпер забраў дабраславеньне маё». І сказаў: «Няўжо ты не захаваў
для мяне дабраславеньня?»
37 І адказаў Ісаак, і сказаў Эзаву: «Вось, я паставіў яго гаспадаром над табою, і ўсіх братоў
ягоных аддаў яму за слугаў, і збожжам і віном абдарыў яго. А табе што я зраблю, сыне мой?»
38 І сказаў Эзаў бацьку свайму: «Ці [толькі] адно дабраславеньне ў цябе, ойча мой? Дабраславі
мяне, таксама мяне, ойча мой!» І ўзвысіў Эзаў голас свой, і заплакаў.
39 І адказаў Ісаак, бацька ягоны, і сказаў яму: «Вось, далёка ад тлустасьці зямлі будзе месца
жыцьця твайго і [далёка] ад расы з неба ўгары,
40 і з мяча свайго будзеш жыць, і брату свайму будзеш служыць. І станецца, што ты запануеш,
і скінеш ярмо ягонае з шыі сваёй».
41 І зьненавідзеў Эзаў Якуба дзеля дабраславеньня, якім дабраславіў яго бацька ягоны, і сказаў
Эзаў у сэрцы сваім: «Набліжаюцца дні жалобы па бацьку маім, і я заб'ю Якуба, брата майго».
42 І распавялі Рэбэцы словы Эзава, сына ейнага старэйшага, і яна паслала, і паклікала Якуба,
сына свайго малодшага, і сказала яму: «Вось, Эзаў, брат твой, суцяшае сябе адносна цябе, што
заб'е цябе.
43 І цяпер, сыне мой, паслухай голасу майго, і ўстань, уцякай да Лявана, брата майго, у Харан,
44 і пажыві з ім нейкі час, пакуль адыйдзе гнеў ад брата твайго.
45 Калі адыйдзе гнеў на цябе ад брата твайго, і ён забудзецца, што ты ўчыніў яму, я пашлю і
вазьму цябе адтуль. Дзеля чаго маю страціць абодвух [сыноў] у адзін дзень?»
46 І сказала Рэбэка Ісааку: «Абрыдла мне жыцьцё маё з прычыны дачок Хета. Калі возьме Якуб
жонку з дачок Хета, якія з дочак зямлі гэтай, дык навошта мне жыцьцё?»

Бц 28

1 І паклікаў Ісаак Якуба, і дабраславіў яго, і загадаў яму, і сказаў яму: «Не бяры сабе жонкі з
дачок Ханаану.
2 Устань, ідзі ў Падан-Арам, у дом Бэтуэля, бацькі маці тваёй, і вазьмі сабе адтуль жонку з
дачок Лявана, брата маці тваёй.
3 І Бог Усемагутны дабраславіць цябе, і зробіць цябе плодным, і памножыць цябе, і ты станешся
супольнасьцю народаў,
4 і Ён дасьць табе дабраславеньне Абрагама, табе і насеньню твайму з табою, каб ты ўзяў у
спадчыну зямлю вандраваньня твайго, якую Бог даў Абрагаму».
5 І паслаў Ісаак Якуба, і ён пайшоў у Падан-Арам да Лявана, сына Бэтуэля Арамейца, брата
Рэбэкі, маці Якуба і Эзава.

6 І бачыў Эзаў, што дабраславіў Ісаак Якуба, і, дабраслаўляючы яго, паслаў яго ў Падан-Арам
узяць сабе адтуль жонку, і загадаў яму, кажучы: «Не бяры жонкі з дачок Ханаану»;
7 і што паслухаў Якуб бацьку свайго і маці сваю, і пайшоў у Падан-Арам.
8 І бачыў Эзаў, што ліхія дочкі Ханаану ў вачах Ісаака, бацькі ягонага.
9 І пайшоў Эзаў да Ізмаэля, і ўзяў за жонку сабе Махалят, дачку Ізмаэля, сына Абрагама, сястру
Наваёта, акрамя тых жонак, якія меў.
10 І выйшаў Якуб з Бээр-Шэвы, і пайшоў у Харан.
11 І трапіў ён на адно месца, і заначаваў там, бо зайшло сонца. І ўзяў камяні з таго месца, і
палажыў пад галаву сваю, і лёг спаць на тым месцы.
12 І сьніў ён, і вось, лесьвіца стаіць на зямлі, а верх яе дакранаецца да неба; і вось, анёлы Божыя
ўзыходзяць і зыходзяць па ёй.
13 І вось, ГОСПАД стаў над ім і сказаў: «Я — ГОСПАД, Бог Абрагама, бацькі твайго, і Бог Ісаака.
Зямлю, на якой ты ляжыш, Я дам табе і насеньню твайму.
14 І станецца насеньне тваё, як пясок зямлі; і ты распаўсюдзішся на захад, і на ўсход, і на
поўнач, і на поўдзень, і будуць дабраслаўлёныя ў табе і ў насеньні тваім усе плямёны зямлі.
15 І вось, Я з табою, і буду захоўваць цябе ўсюды, куды ты пойдзеш, і вярну цябе ў гэтую зямлю,
бо Я не пакіну цябе, пакуль не зраблю таго, што Я сказаў табе».
16 І прачнуўся Якуб зо-сну свайго, і сказаў: «Сапраўды ГОСПАД ёсьць на месцы гэтым, а я ня
ведаў!»
17 І спалохаўся, і сказаў: «Якое страшнае месца гэтае! Гэта нішто іншае, як дом Божы, і гэта
брама неба».
18 І ўстаў Якуб рана раніцай, і ўзяў камень, які ён палажыў пад галаву сваю, і паставіў яго як
слуп, і наліў алей на верх ягоны.
19 І назваў імя месца таго Бэтэль; а раней імя гораду таго было Люз.
20 І абяцаў Якуб абяцаньне, кажучы: «Калі Бог будзе са мною, і будзе захоўваць мяне на гэтым
шляху, якім я іду, і дасьць мне хлеб есьці і адзежу адзецца,
21 і я вярнуся ў супакоі ў дом бацькі майго, і будзе ГОСПАД мне Богам,
22 дык камень гэты, які я паставіў як слуп, будзе домам Божым, і з усяго, што Ты дасі мне, я
аддзялю Табе дзесяціну».

Бц 29

1 І ўстаў Якуб на ногі свае, і пайшоў у зямлю сыноў Усходу.
2 І ўбачыў, і вось, студня на полі, і вось, там тры чарады авечак ляжаць каля яе, бо са студні
гэтай паілі чароды, і вялікі камень быў на адтуліне студні.
3 І зьбіраліся туды ўсе чароды, і адкочвалі камень з адтуліны студні, і паілі авечак, і зноў
вярталі камень на месца сваё.
4 І сказаў ім Якуб: «Браты мае, адкуль вы?» І яны сказалі: «Мы з Харану».
5 І ён сказаў ім: «Ці ведаеце вы Лявана, сына Нахора?» І яны сказалі: «Ведаем».
6 І ён сказаў ім: «Ці добра ён маецца?» І яны сказалі: «Добра. А вось, Рахель, дачка ягоная,
прыйшла з авечкамі».
7 І ён сказаў: «Вось, яшчэ вялікі дзень [наперадзе]; ня час зьбіраць статак; напаіце авечак, і
ідзіце, і пасьвіце».
8 А яны сказалі: «Ня можам, аж пакуль не зьбяруцца ўсе чароды, і не адкоцяць камень з
адтуліны студні, і тады напоім авечак».
9 Яшчэ ён гаварыў з імі, і вось, Рахель прыйшла з авечкамі бацькі свайго, бо яна пасьвіла [іх].
10 І сталася, калі ўбачыў Якуб Рахель, дачку Лявана, брата маці сваёй, і авечкі Лявана, брата
маці сваёй, падыйшоў Якуб, і адкаціў камень з адтуліны студні, і напаіў авечак Лявана, брата
маці сваёй.
11 І пацалаваў Якуб Рахель, і ўзвысіў голас свой, і заплакаў.
12 І распавёў Якуб Рахелі, што ён брат бацьку ейнаму, і што ён сын Рэбэкі. І яна пабегла, і
распавяла бацьку свайму.

13 І сталася, калі пачуў Ляван навіну пра Якуба, сына сястры сваёй, выбег яму насустрач, і
абняў яго, і пацалаваў яго, і прывёў яго ў дом свой, і ён распавёў Лявану пра ўсе падзеі.
14 І сказаў яму Ляван: «Вось, ты — костка мая і цела маё». І жыў у яго цэлы месяц.
15 І сказаў Ляван Якубу: «Хоць ты брат мой, ці ж будзеш служыць мне задарма? Скажы мне,
якая плата твая?»
16 А ў Лявана былі дзьве дачкі, імя старэйшай — Лея, а імя малодшай — Рахель.
17 Вочы Леі былі кволыя, а Рахель была прыгожая пастацьцю і прыгожая аблічам.
18 І пакахаў Якуб Рахель, і сказаў: «Я буду служыць табе сем гадоў за Рахель, дачку тваю
малодшую».
19 І сказаў Ляван: «Лепш, калі я аддам яе за цябе, чым аддам за іншага чалавека. Жыві са
мною».
20 І служыў Якуб за Рахель сем гадоў, і былі яны ў вачах ягоных як некалькі дзён, бо ён кахаў
яе.
21 І сказаў Якуб Лявану: «Дай жонку маю, бо споўніліся дні мае, і я пайду да яе».
22 І сабраў Ляван усіх людзей таго месца, і справіў гасьціну.
23 І быў вечар, і ўзяў ён Лею, дачку сваю, і ўвёў яе да яго, і той увайшоў да яе.
24 І даў Ляван Зільпу, нявольніцу сваю, Леі, дачцэ сваёй, за нявольніцу.
25 І сталася раніцаю, што [ўбачыў Якуб], вось, гэта Лея. І сказаў [Якуб] Лявану: «Што ты зрабіў
мне? Ці не за Рахель я служыў у цябе? Чаму ж ты ашукаў мяне?»
26 І сказаў Ляван: «Ня робіцца так у мясцовасьці нашай, каб малодшую выдаваць перад
старэйшай.
27 Споўні тыдзень з гэтай, і дам табе таксама тую, за якую ты будзеш служыць у мяне яшчэ сем
іншых гадоў».
28 І зрабіў Якуб так, і споўніў тыдзень з гэтай. І [Ляван] даў Рахель, дачку сваю, яму за жонку.
29 І даў Ляван Рахелі, дачцэ сваёй, Більгу, нявольніцу сваю, за нявольніцу для яе.
30 І ўвайшоў [Якуб] да Рахелі, і кахаў Рахель больш за Лею; і служыў у яго яшчэ сем іншых
гадоў.
31 І бачыў ГОСПАД, што зьненавіджана Лея, і адчыніў улоньне ейнае, а Рахель была
бясплодная.
32 І зачала Лея, і нарадзіла сына, і назвала імя яго Рубэн, бо сказала: «Бо ўбачыў ГОСПАД гора
маё, бо цяпер будзе кахаць мяне муж мой».
33 І зачала яна ізноў, і нарадзіла сына, і сказала: «Бо пачуў ГОСПАД, што я зьненавіджана, і даў
мне гэтага [сына]». І назвала імя ягонае Сымон.
34 І зачала яшчэ, і нарадзіла сына, і сказала: «Цяпер, гэтым разам прытуліцца муж мой да
мяне, бо я нарадзіла яму трох сыноў». І таму назвала імя ягонае Левій.
35 І зачала яшчэ, і нарадзіла сына, і сказала: «Гэтым разам я буду славіць ГОСПАДА». І таму
назвала імя ягонае Юда, і перастала нараджаць.

Бц 30

1 І бачыла Рахель, што яна не нараджае Якубу, і зайздросьціла Рахель сястры сваёй, і казала
Якубу: «Дай мне сыноў, а калі не, я памру».
2 І ўзгарэўся гнеў Якуба на Рахель, і ён сказаў: «Ці ж гэта я, а ня Бог затрымаў у цябе плод
улоньня?»
3 І яна сказала: «Вось, нявольніца мая Більга. Увайдзі да яе, і яна народзіць на каленях маіх, і
я буду збудаваная праз яе».
4 І яна дала яму Більгу, нявольніцу сваю, за жонку, і ўвайшоў да яе Якуб.
5 І зачала Більга, і нарадзіла Якубу сына.
6 І сказала Рахель: «Рассудзіў мяне Бог, і таксама пачуў голас мой, і даў мне сына». І таму
назвала імя ягонае Дан.
7 І зачала яшчэ, і нарадзіла Більга, нявольніца Рахелі, другога сына Якубу.
8 І сказала Рахель: «Ваяваньнем Божым змагалася я з сястрою сваёй і адолела». І назвала імя
ягонае Нэфталі.

9 І ўбачыла Лея, што перастала нараджаць, і ўзяла Зільпу, нявольніцу сваю, і дала яе Якубу за
жонку.
10 І нарадзіла Зільпа, нявольніца Леі, Якубу сына.
11 І сказала Лея: «Прыйшоў посьпех!» І назвала імя ягонае Гад.
12 І нарадзіла Зільпа, нявольніца Леі, другога сына Якубу.
13 І сказала Лея: «На шчасьце маё, бо шчасьлівай будуць называць мяне дочкі». І назвала імя
ягонае Асэр.
14 І выйшаў Рубэн у дні жніва пшаніцы, і знайшоў мандрагоры ў полі, і прынёс іх Леі, маці
сваёй. І сказала Рахель Леі: «Дай мне мандрагоры сына твайго».
15 А тая сказала ёй: «Няўжо мала [табе], што ты ўзяла мужа майго, і хочаш узяць мандрагоры
сына майго?» І сказала Рахель: «Дык няхай ён ляжа з табою ў гэтую ноч за мандрагоры сына
твайго».
16 І прыйшоў Якуб з поля ўвечары, і выйшла Лея насустрач яму, і сказала: «Да мяне ўвойдзеш,
бо наймаючы, наняла цябе за мандрагоры сына майго». І ён лёг з ёю ў тую ноч.
17 І пачуў Бог Лею, і яна зачала, і нарадзіла Якубу пятага сына.
18 І сказала Лея: «Даў Бог плату маю за тое, што я дала нявольніцу маю мужу майму». І назвала
імя ягонае Ісахар.
19 І зачала ізноў Лея, і нарадзіла шостага сына Якубу.
20 І сказала Лея: «Абдараваў мяне Бог добрым дарам. Гэтым разам будзе жыць са мною муж
мой, бо я нарадзіла яму шэсьць сыноў». І назвала імя ягонае Завулён.
21 Потым нарадзіла дачку, і назвала імя ейнае Дзіна.
22 І ўзгадаў Бог пра Рахель, і пачуў яе Бог, і адчыніў улоньне ейнае,
23 і яна зачала, і нарадзіла сына, і сказала: «Забраў Бог ганьбу маю».
24 І назвала імя ягонае Язэп, кажучы: «Няхай дадасьць мне ГОСПАД другога сына».
25 І сталася, калі нарадзіла Рахель Язэпа, сказаў Якуб Лявану: «Пусьці мяне, і я пайду ў
мясцовасьць сваю і ў зямлю сваю.
26 Дай мне жонак маіх і дзяцей маіх, бо я служыў табе за іх, і я пайду; бо ты ведаеш службу
маю, якою я служыў табе».
27 І сказаў яму Ляван: «О, каб я знайшоў ласку ў вачах тваіх! Я пераканаўся, што ГОСПАД
дабраславіў мяне дзеля цябе».
28 І сказаў: «Прызнач сабе плату сваю ад мяне, і я дам».
29 І [Якуб] сказаў яму: «Ты ведаеш, як я служыў табе, і які стаўся статак твой пры мне;
30 бо мала было ў цябе да мяне, а памножылася ў мноства, і дабраславіў ГОСПАД цябе, калі я
прыйшоў. А цяпер, калі я буду рабіць для дому майго?»
31 І той сказаў: «Што маю даць табе?» І сказаў Якуб: «Не давай мне нічога, але зрабі для мяне
такую рэч, і я вярнуся, і буду пасьвіць і захоўваць авечкі твае.
32 Я прайду сёньня між усіх авечак тваіх, і аддзялю з іх кожнае ягня стракатае і пярэстае, і
кожную рудую з авечак, і стракатых і пярэстых з козаў; і будзе гэта мая плата.
33 І будзе адказваць за мяне праведнасьць мая на наступны дзень, калі прыйдзеш даведацца
пра плату маю перад табою. Усё ў мяне, што не стракатае і не пярэстае паміж козаў, і не рудое
паміж авечак, крадзенае гэта».
34 І сказаў Ляван: «Няхай будзе паводле слова твайго».
35 І адлучыў у той дзень казлоў пасастых і пярэстых, і ўсіх козаў стракатых і пярэстых, усіх,
што мелі нешта белае на сабе, і ўсіх рудых паміж авечак, і аддаў у рукі сыноў сваіх.
36 І вызначыў дарогу ў тры дні паміж сабою і Якубам. І Якуб пасьвіў авечкі Лявана, якія
засталіся.
37 І ўзяў Якуб зялёных прутоў тапалёвых, і мігдалёвых, і яваровых, і выразаў на іх пасы белыя,
зьняўшы кару да бялосьці, якая на прутах,
38 і ўткнуў тыя пруты, якія аблупіў, перад авечкамі пры карытах каля вадапою, куды
прыходзілі авечкі піць і спалучаліся, прыходзячы піць.
39 І спалучаліся авечкі перад прутамі, і нараджаліся авечкі пасастыя, стракатыя і пярэстыя.

40 І авечак [белых] аддзяляў Якуб, і гнаў, як авечкі Лявана, наперадзе авечак пярэстых і ўсіх
рудых, і трымаў свае чароды асобна, і не злучаў іх з авечкамі Лявана.
41 І было, калі спалучаліся мацнейшыя авечкі, Якуб клаў пруты перад вачыма авечак пры
карытах, каб яны спалучаліся перад прутамі,
42 а калі авечкі былі слабыя, тады ня клаў. І былі слабейшыя ў Лявана, а мацнейшыя — у Якуба.
43 І пашырыўся чалавек гэты вельмі, вельмі, і было ў яго мноства авечак, і нявольніцаў, і
слугаў, і вярблюдаў, і аслоў.

Бц 31

1 І пачуў [Якуб] словы сыноў Лявана, якія казалі: «Забраў Якуб усё, што было ў бацькі нашага,
і з таго, што было ў бацькі нашага, учыніў сабе ўсю гэтую славу».
2 І бачыў Якуб аблічча Лявана, і вось, ён ня быў з ім такі, як учора і пазаўчора.
3 І сказаў ГОСПАД Якубу: «Вярніся ў зямлю бацькоў тваіх і нараджэньня твайго, і Я буду з
табою».
4 І паслаў Якуб, і паклікаў Рахель і Лею ў поле да авечак сваіх,
5 і сказаў ім: «Я бачу аблічча бацькі вашага, што ён не такі да мяне, як учора ці пазаўчора. І
Бог бацькі майго быў са мною.
6 І вы ведаеце, што я ўсімі сіламі служыў бацьку вашаму,
7 і бацька ваш ашукваў мяне, і зьмяняў плату маю дзесяць разоў, але ня даў яму Бог зрабіць
крыўду мне.
8 Калі сказаў ён: “Стракатыя будуць платай тваёй”, нараджаліся ўсе авечкі стракатыя. А калі
сказаў ён: “Пасастыя будуць платай тваёй”, нараджаліся ўсе авечкі пасастыя.
9 І забраў Бог статак у бацькі вашага, і даў яго мне.
10 І было ў часе параваньня авечак, і ўзьняў я вочы мае, і бачыў у сьне, і вось, бараны, якія
ўскочылі на авечак, былі пасастыя, стракатыя і пярэстыя.
11 І сказаў мне анёл Божы ў сьне: “Якубе!” І я сказаў: “Вось я!”
12 І Ён сказаў: “Узьнімі вочы твае і паглядзі: усе бараны, якія ўскочылі на авечак, пасастыя,
стракатыя і пярэстыя, бо Я бачыў усё, што Ляван робіць табе.
13 Я — Бог з Бэтэлю, дзе ты памазаў слуп і дзе абяцаў Мне абяцаньне. Цяпер устань, выйдзі з
зямлі гэтае, і вярніся ў зямлю нараджэньня твайго”».
14 І адказалі Рахель і Лея, і сказалі яму: «Ці ёсьць яшчэ ў нас частка і спадчына ў доме бацькі
нашага?
15 Ці не за чужых ён нас мае? Бо ён прадаў нас, і еў, зьядаючы срэбра нашае.
16 Таму ўсё багацьце, якое забраў Бог у бацькі нашага, нашае яно і дзяцей нашых. І цяпер усё,
што сказаў Бог табе, рабі».
17 І ўстаў Якуб, і пасадзіў дзяцей сваіх і жонак сваіх на вярблюдаў.
18 І павёў усе статкі свае і ўсю маёмасьць сваю, якую прыдбаў, статкі ўласнасьці сваёй, якую
ён прыдбаў у Падан-Араме, каб ісьці да Ісаака, бацькі свайго, у зямлю Ханаан.
19 А Ляван пайшоў стрыгчы авечкі свае. І ўкрала Рахель балваноў, якія былі ў бацькі ейнага.
20 І ашукаў Якуб сэрца Лявана Арамейца, бо не сказаў яму, што ўцякае.
21 І ўцёк ён з усім, што ў яго; і ўстаў, і перайшоў праз раку, і скіраваў аблічча сваё да гары
Гілеад.
22 І паведамілі Лявану на трэці дзень, што ўцёк Якуб.
23 І ўзяў ён з сабою братоў сваіх, і гнаўся за ім дарогаю сем дзён, і дагнаў яго на гары Гілеад.
24 І прыйшоў Бог да Лявана Арамейца ў сьне ўначы, і сказаў яму: «Сьцеражыся, не гавары
Якубу ані добрага, ані ліхога».
25 І дагнаў Ляван Якуба, а Якуб паставіў намёт свой на гары. І Ляван паставіў [намёт] з братамі
сваімі на гары Гілеад.
26 І сказаў Ляван Якубу: «Што ты зрабіў? Ты ашукаў сэрца маё, і вывеў дочак маіх, быццам
палоненых мячом.

27 Чаму ты патаемна ўцёк, і абакраў мяне, і не сказаў мне? І я адпусьціў бы цябе з радасьцю і
сьпевамі, з бубнамі і гусьлямі.
28 А ты не дазволіў мне пацалаваць сыноў маіх і дочак маіх. Гэта ты дрэнна зрабіў.
29 Ёсьць сіла ў руцэ маёй учыніць вам ліха, але Бог бацькі вашага ўчора ўначы сказаў мне,
кажучы: “Сьцеражыся, не гавары Якубу ані добрага, ані ліхога”.
30 І цяпер ты, ідучы, пайшоў, бо ты сумуючы, засумаваў па доме бацькі твайго. Але навошта
ты скраў багоў маіх?»
31 І адказаў Якуб, і сказаў Лявану: «Бо я баяўся, бо я казаў, што ты забярэш дочак сваіх у мяне.
32 У каго знойдзеш багоў сваіх, той ня будзе жыць. Перад братамі нашымі правер, што ёсьць у
мяне, і вазьмі сабе». А ня ведаў Якуб, што Рахель скрала іх.
33 І ўвайшоў Ляван у намёт Якуба, і ў намёт Леі, і намёт дзьвюх нявольніцаў, і не знайшоў. І
выйшаў з намёту Леі, і ўвайшоў у намёт Рахелі.
34 А Рахель узяла балваноў, і палажыла іх пад вярблюджае сядло, і села на іх. І абшукаў Ляван
увесь намёт, і не знайшоў.
35 І сказала яна бацьку свайму: «Няхай не ўзгарыцца гнеў у вачах пана майго, што я не магу
ўстаць перад табою, бо слабасьць жаночая ў мяне». І ён шукаў, і не знайшоў балваноў.
36 І ўзгарэўся гнеў Якуба, і ён сварыўся з Ляванам. І адказаў Якуб, і сказаў Лявану: «Якая віна
мая, які грэх мой, што ты гнаўся за мною?
37 Бо ты абшукаў усе рэчы мае. Ці знайшоў ты нешта з рэчаў дому свайго? Палажы іх тут перад
братамі маімі і братамі тваімі. Няхай яны рассудзяць паміж намі двума.
38 Вось, дваццаць год я [быў] з табою. Авечкі твае і козы твае не скідалі, і бараноў з авечак тваіх
я ня еў.
39 Разьдзёртага [зьвярамі] я не прыносіў да цябе, я сам нёс віну, з рукі маёй ты шукаў гэта, ці
яно было ўкрадзена ўдзень, ці ўкрадзена ўначы.
40 Было, што ўдзень жэрла мяне гарачыня, і мароз — уначы; і ўцякаў сон мой з вачэй маіх.
41 Гэтакія [былі] мае дваццаць гадоў у доме тваім. Я служыў табе чатырнаццаць гадоў за дзьве
дочкі твае і шэсьць гадоў за авечак тваіх, і ты зьмяняў плату маю дзесяць разоў.
42 Калі б Бог бацькі майго, Бог Абрагама і [Той, Каго] баіцца Ісаак, ня быў са мною, дык цяпер
пустым ты выслаў бы мяне. Пакуты мае і працу рук маіх бачыў Бог і рассудзіў учора ўвечары».
43 І адказаў Ляван, і сказаў Якубу: «Дочкі гэтыя — мае дочкі, і сыны гэтыя — мае сыны; і авечкі
гэтыя — мае авечкі, і ўсё, што ты бачыш, — гэта маё. І дочкам маім, што я зраблю ім сёньня,
або сынам іхнім, якіх яны нарадзілі?
44 А цяпер хадзі, заключым запавет я і ты, і ён будзе сьведчаньнем паміж мною і табою».
45 І ўзяў Якуб камень, і паставіў яго як слуп.
46 І сказаў Якуб братам сваім: «Назьбірайце камянёў». І яны ўзялі камяні, і зрабілі крушню, і
елі там на крушні.
47 І назваў яе Ляван Егар-Сагадута, а Якуб назваў яе Галед.
48 І сказаў Ляван: «Крушня гэтая — сьведчаньне паміж мною і табою сёньня». Таму і назвалі
імя ейнае Галед
49 і Міцпа, бо ён сказаў: «Няхай назірае ГОСПАД паміж мною і табою, калі разыйдземся адзін
ад аднаго.
50 Калі ты будзеш уціскаць дочак маіх і калі возьмеш жонак акрамя дочак маіх, [хоць] няма
чалавека з намі, глядзі, Бог — сьведка паміж мною і табою».
51 І сказаў Ляван Якубу: «Вось крушня гэтая, і вось слуп, які я паставіў паміж мною і табою.
52 Сьведкам [будзе] крушня гэтая і сьведкам [будзе] слуп, што ані я не перайду да цябе за
гэтую крушню і за гэты слуп, ані ты не пяройдзеш да мяне за гэтую крушню і за гэты слуп з
ліхім [намерам].
53 Бог Абрагама і Бог Нахора, Бог бацькоў іхніх няхай судзіць нас». І прысягнуў Якуб на [Таго,
Каго] баіцца бацька ягоны Ісаак.
54 І ахвяраваў Якуб ахвяру на гары, і паклікаў братоў сваіх есьці хлеб. І яны елі хлеб, і начавалі
на гары.

55 І ўстаў Ляван рана раніцай, і пацалаваў сыноў сваіх і дочак сваіх, і дабраславіў іх, і пайшоў,
і вярнуўся Ляван на месца сваё.

Бц 32

1 А Якуб пайшоў дарогаю сваёй. І сустрэлі яго анёлы Божыя.
2 І сказаў Якуб, убачыўшы іх: «Гэта табар Божы». І назваў імя месца таго Маханаім.
3 І паслаў Якуб пасланцоў перад сабою да Эзава, брата свайго, у зямлю Сэір, на поле Эдому.
4 І загадаў ім, кажучы: «Гэтак скажаце пану майму Эзаву: “Так кажа слуга твой Якуб. У Лявана
я жыў, і заставаўся аж дагэтуль.
5 І сталася, што маю вала і асла, і авечку, і слугу, і нявольніцу, і я паслаў сказаць пану майму,
каб знайсьці ласку ў вачах тваіх”».
6 І вярнуліся пасланцы да Якуба, кажучы: «Мы прыйшлі да брата твайго, да Эзава, і ён таксама
ідзе насустрач табе, і чатырыста чалавек з ім».
7 І спалохаўся Якуб вельмі, і быў стрывожаны, і падзяліў людзей, якія былі з ім, і авечак, і
валоў, і вярблюдаў на два табары,
8 І сказаў: «Калі Эзаў прыйдзе на адзін табар і выб’е яго, табар, які застанецца, уцячэ».
9 І сказаў Якуб: «Божа бацькі майго Абрагама і Божа бацькі майго Ісаака, ГОСПАДЗЕ, Ты сказаў
мне: “Вярніся ў зямлю тваю, да родзічаў тваіх, і Я зраблю, каб было добра табе”.
10 Я ня варты ўсёй міласэрнасьці і ўсёй праўды, якую Ты ўчыніў для слугі Твайго, бо я з кіем
маім перайшоў Ярдан гэты, а цяпер стаю з двума табарамі.
11 Выратуй, прашу, мяне з рукі брата майго, з рукі Эзава, бо я баюся яго, каб ён не прыйшоў, і
не забіў мяне, і матак разам з сынамі.
12 Ты сказаў: “Робячы дабро, буду рабіць дабро табе, і зраблю насеньне тваё як пясок марскі,
якога нельга палічыць дзеля мноства [яго]”».
13 І начаваў там у тую ноч, і ўзяў з таго, што прыйшло ў рукі яму, дары для Эзава, брата свайго:
14 козаў дзьвесьце, казлоў дваццаць, авечак дзьвесьце і бараноў дваццаць,
15 вярблюдзіцаў дойных з вярблюдзянятамі іхнімі трыццаць, кароў сорак і валоў дзесяць,
асьліцаў дваццаць і асьлянят дзесяць.
16 І даў у рукі слугам сваім кожную чараду асобна, і сказаў слугам сваім: «Ідзіце перада мною
і трымайце адлегласьць паміж чарадой і чарадой».
17 І загадаў першаму, кажучы: «Калі сустрэне цябе Эзаў, брат мой, і спытаецца ў цябе, кажучы:
“Чый ты і куды ідзеш? І чыё гэта перад абліччам тваім?",
18 ты скажаш: “Слугі твайго Якуба. Гэты дар пасланы пану майму Эзаву І вось, таксама ён
[ідзе] за намі”».
19 І загадаў тое самае другому, і трэцяму, і ўсім, якія ішлі за чародамі, кажучы: «Паводле
словаў гэтых кажыце Эзаву, калі знойдзеце яго,
20 і скажаце таксама: “Вось, слуга твой Якуб [ідзе] за намі”». Бо ён казаў: «Умалю аблічча
ягонае дарам, які ідзе перада мною, і потым убачу аблічча ягонае. Можа, ён узьніме аблічча
маё».
21 І перайшоў [ручай] дар перад ім, а ён начаваў у тую ноч у табары.
22 І ўстаў ён у тую ноч, і ўзяў дзьве жонкі свае, і дзьве нявольніцы свае, і адзінаццаць дзяцей
сваіх, і перайшоў у брод Ябок.
23 І ўзяў іх, і перавёў іх праз ручай, і перавёў, што было ў яго.
24 І застаўся Якуб сам адзін. І дужаўся з ім Муж да ўзыходу зараніцы.
25 І Той убачыў, што не пераможа яго, і дакрануўся да сустава сьцягна ягонага, і пашкодзіў
сустаў сьцягна Якуба, калі дужаўся з ім,
26 і сказаў: «Пусьці Мяне, бо ўзыйшла зараніца». І сказаў [Якуб]: «Не пушчу Цябе, пакуль не
дабраславіш мяне».
27 І Ён сказаў яму: «Якое імя тваё?» А ён сказаў: «Якуб».
28 І сказаў: «Не Якуб будуць называць ужо імя тваё, але Ізраіль, бо ты змагаўся з Богам і з
людзьмі, і перамог».

29 І спытаўся Якуб, і сказаў: «Скажы, калі ласка, імя Тваё». І Ён сказаў: «Навошта ты пытаешся
імя Маё?» І дабраславіў яго там.
30 І назваў Якуб імя таго месца: Пэніэль, бо [казаў]: «Я бачыў Бога аблічча м да аблічча, і
захаваная душа мая».
31 І ўзыйшло сонца, калі ён праходзіў Пэніэль, і ён накульгваў на сьцягно сваё.
32 Дзеля гэтага не ядуць сыны Ізраіля жылы цягліцы, якая на суставе сьцягна, аж да сёньня, бо
Ён дакрануўся да суставу сьцягна Якуба, да жылы цягліцы.

Бц 33

1 І ўзьняў Якуб вочы свае, і ўбачыў, і вось, Эзаў прыйшоў, і з ім чатырыста чалавек. І ён падзяліў
дзяцей Леі, Рахелі і дзьвюх нявольніцаў.
2 І паставіў нявольніцаў і дзяцей іхніх першымі, а Лею і дзяцей ейных за імі, а Рахель і Язэпа
за імі.
3 І ён выйшаў перад імі, і пакланіўся да зямлі сем разоў, пакуль наблізіўся да брата свайго.
4 І пабег Эзаў яму насустрач, і абняў яго, і ўпаў на шыю яму, і цалаваў яго, і плакалі [разам].
5 І ўзьняў ён вочы свае, і ўбачыў жанчынаў і дзяцей, і сказаў: «Хто яны табе?» І сказаў [Якуб]:
«Дзеці, якімі Бог абдараваў слугу твайго».
6 І наблізіліся нявольніцы, самі і дзеці іхнія, і пакланіліся.
7 І наблізілася таксама Лея і дзеці ейныя, і пакланіліся. А потым наблізіліся Язэп і Рахель, і
пакланіліся.
8 І сказаў [Эзаў]: «Што ў цябе за цэлы табар гэты, які я сустрэў?» І сказаў [Якуб]: «Каб знайсьці
ласку ў вачах пана майго».
9 І сказаў Эзаў: «Маю я шмат, браце мой. Няхай будзе тваё тое, што ў цябе».
10 І сказаў Якуб: «Не, прашу, калі я знайшоў ласку ў вачах тваіх, прыймі дар мой з рукі маёй,
бо я, убачыўшы аблічча тваё, быццам убачыў аблічча Божае, і ты меў ласку да мяне.
11 Прыймі, прашу, дабраславенства маё, якое я прывёў табе, бо Бог абдараваў мяне, і я маю
ўсё». І ён упрасіў яго, і той узяў.
12 І сказаў [Эзаў]: «Вырушым і пойдзем, і я буду ісьці разам з табою».
13 І сказаў яму [Якуб]: «Пан мой ведае, што дзеці кволыя, і авечкі котныя, і каровы цельныя ў
мяне. Калі пагнаць іх адзін дзень, паздыхаюць усе авечкі.
14 Няхай пан мой пойдзе перад абліччам слугі свайго, а я пайду паволі, паводле хады чарады,
якая перада мною, і паводле хады дзяцей, аж прыйду да пана майго ў Сэір».
15 І сказаў Эзаў: «Я пакіну з табою [частку] людзей, якія са мною». І сказаў [Якуб]: «Навошта
гэта, калі я знайшоў ласку ў вачах пана майго».
16 І вярнуўся ў той дзень Эзаў шляхам сваім у Сэір.
17 А Якуб вырушыў у Сукот і пабудаваў сабе дом, а статку свайму парабіў буданы. Дзеля гэтага
ён назваў імя месцу таму Сукот.
18 І прыйшоў Якуб у супакоі да гораду Сыхем, які ў зямлі Ханаан, калі прыйшоў з Падан-Араму,
і паставіў [намёты] перад горадам.
19 І купіў ён частку поля, на якім паставіў намёт свой, з рукі сыноў Гамора, бацькі Сыхема, за
сто кесытаў.
20 І паставіў там ахвярнік, і назваў яго «Бог ёсьць Бог Ізраіля».

Бц 34

1 І выйшла Дзіна, дачка Леі, якую яна нарадзіла Якубу, паглядзець на дочак зямлі той.
2 І ўбачыў яе Сыхем, сын Гамора Хівея, князя зямлі той, і ўзяў яе, і ляжаў з ёю, і згвалціў яе.
3 І прыляпілася душа ягоная да Дзіны, дачкі Якуба, і ён пакахаў дзяўчыну, і гаварыў да сэрца
дзяўчыны.
4 І сказаў Сыхем Гамору, бацьку свайму, кажучы: «Вазьмі мне дзяўчыну гэтую за жонку».
5 І Якуб пачуў, што зганьбавана Дзіна, дачка ягоная, а сыны ягоныя былі пры статку на полі, і
маўчаў Якуб, пакуль не прыйшлі яны.

6 І выйшаў Гамор, бацька Сыхему, да Якуба паразмаўляць з ім.
7 А сыны Якуба прыйшлі з поля, і, пачуўшы, засмуціліся мужы, і гневаліся вельмі, бо ганьбу
зрабіў [Сыхем] Ізраілю, лёгшы з дачкою Якуба, бо гэтак ня робіцца.
8 І гаварыў Гамор з імі, кажучы: «Сыхем, сын мой, прыляпіўся душою сваёю да дачкі вашае.
Дайце, прашу, яе яму за жонку.
9 І пасваячцеся з намі, дочак вашых дайце нам, а дочак нашых бярыце сабе.
10 І з намі жывіце, і зямля гэтая будзе перад абліччам вашым, жывіце і гандлюйце ў ёй, і бярыце
яе [на ўласнасьць]».
11 І сказаў Сыхем бацьку ейнаму і братам ейным: «Каб я знайшоў ласку ў вачах вашых, і што
скажаце мне, я дам.
12 Павялічце мне вельмі вена і дары, і я дам, што вы скажаце мне, толькі дайце мне дзяўчыну
за жонку».
13 І адказалі сыны Якуба Сыхему і Гамору, бацьку ягонаму, падступна, і гаварылі так, бо ён
зганьбіў Дзіну, сястру іхнюю.
14 І сказалі ім: «Ня можам зрабіць гэтага, выдаць сястру нашую чалавеку, які мае скуравінку,
бо ганьба гэта для нас.
15 Толькі тады мы пагодзімся з вамі, калі вы будзеце, як мы, каб быў абрэзаны ў вас кожны
мужчына.
16 І будзем даваць дочак нашых вам, а дочак вашых браць сабе, і будзем жыць з вамі, і будзем
адзін народ.
17 А калі не паслухаеце нас, каб абрэзацца, мы возьмем дачку нашую і адыйдзем».
18 І былі добрымі словы іхнія ў вачах Гамора і ў вачах Сыхема, сына Гамора.
19 І не затрымаўся юнак той зрабіць гэтую справу, бо ён жадаў дачку Якуба. А ён быў найбольш
шанаваны ў-ва ўсім доме бацькі свайго.
20 І прыйшоў Гамор і Сыхем, сын ягоны, да брамы гораду свайго, і гаварылі жыхарам гораду
свайго, кажучы:
21 «Гэтыя людзі прыязныя да нас. Няхай яны жывуць у зямлі гэтай і гандлююць у ёй. І зямля
гэтая прасторная перад абліччам іхнім. Дочак іхніх возьмем сабе за жонак, а дочак нашых
дамо ім.
22 Толькі пры адной [умове] пагодзяцца з намі людзі гэтыя, каб жыць з намі і быць адным
народам, калі ў нас будуць абрэзаныя ўсе мужчынскага [роду], як яны абрэзаныя.
23 Статкі іхнія, і маёмасьць іхняя, і ўся скаціна іхняя, ці ж ня нашая [будзе]? Толькі пагодзімся
з імі, і яны будуць жыць з намі».
24 І паслухалі Гамора і Сыхема, сына ягонага, усе, што выходзілі з брамы гораду свайго; і былі
абрэзаныя ўсе мужчынскага [роду], усе, што выходзілі з брамы гораду свайго.
25 І сталася на трэці дзень, калі яны былі ў вялікім болю, узялі два сыны Якуба, Сымон і
Левій, браты Дзіны, кожны меч свой, і ўвайшлі ў горад, [які пачуваўся] бясьпечна, і забілі ўсіх
мужчынаў.
26 І Гамора, і Сыхема, сына ягонага, забілі вострывам мяча, і ўзялі Дзіну з дому Сыхема, і
выйшлі.
27 Сыны Якуба прыйшлі да забітых і зрабавалі горад за тое, што зганьбілі сястру іхнюю.
28 І авечак іхніх, і валоў іхніх, і аслоў іхніх, і тое, што было ў горадзе і што было ў полі, яны
ўзялі.
29 І ўсё багацьце іхняе, і ўсіх дзяцей іхніх, і жанчынаў іхніх узялі ў палон, і зрабавалі ўсё, што
было ў дамах.
30 І сказаў Якуб Сымону і Левію: «Вы зрабілі зьнішчэньне мне, зрабіўшы мяне агідным для
жыхароў зямлі гэтае, Хананейцаў і Пэрэзэяў, а ў мяне людзей няшмат, і зьбяруцца на мяне, і
паб'юць мяне, і будуць зьнішчаны я і дом мой».
31 А яны сказалі: «Ці ж можна рабіць з сястрою нашаю як з блудніцаю?»

Бц 35

1 І сказаў Бог Якубу: «Устань, узыйдзі ў Бэтэль, і жыві там, і зрабі там ахвярнік Богу, Які
зьявіўся табе, калі ты ўцякаў ад аблічча Эзава, брата твайго».
2 І сказаў Якуб дому свайму і ўсім, якія [былі] з ім: «Аддзяліце [ад сябе] багоў чужых, якія
сярод вас, і ачысьціцеся, і зьмяніце адзеньні вашыя,
3 і ўстаньма, і ўзыйдзем у Бэтэль, і я зраблю там ахвярнік Богу, Які адказаў мне ў дзень нядолі
маёй і быў са мною ў дарозе, якой я ішоў».
4 І аддалі Якубу ўсіх багоў чужых, якія былі ў руках іхніх, і завушніцы, што былі ў вушах іхніх;
і закапаў іх Якуб пад дубам, які каля Сыхему.
5 І вырушылі яны. І быў жах Божы на гарадах, што [былі] ў той ваколіцы, і ня гналіся яны за
сынамі Якуба.
6 І прыйшоў Якуб у Люз, які ў зямлі Ханаан, ён жа Бэтэль, сам і ўвесь народ, які з ім.
7 І пабудаваў ён там ахвярнік, і назваў гэтае месца Эль-Бэт-Эль, бо там зьявіўся яму Бог, калі
ён уцякаў ад аблічча брата свайго.
8 І памерла Дэвора, нянька Рэбэкі, і была пахаваная ніжэй Бэтэлю пад дубам, і названа імя
ягонае «Дуб плачу».
9 І зьявіўся Бог Якубу ізноў пасьля прыходу ягонага з Падан-Араму, і дабраславіў яго.
10 І сказаў яму Бог: «Імя тваё Якуб. Ня будзе ўжо называцца імя тваё Якуб, але Ізраіль будзе
імя тваё». І назваў яго імя Ізраіль.
11 І сказаў яму Бог: «Я — Бог Усемагутны! Пладзіся і памнажайся! Народ і супольнасьць
народаў будзе з цябе, і валадары выйдуць з паясьніцы тваёй.
12 І зямлю, якую Я даў Абрагаму і Ісааку, Я дам табе, і насеньню твайму пасьля цябе Я дам
зямлю гэтую».
13 І ўзыйшоў ад яго Бог з месца, на якім гаварыў з ім.
14 І паставіў Якуб слуп на месцы, на якім [Бог] гаварыў з ім, слуп каменны, і ўзьліў на яго
ўзьліваньне, і ўзьліў на яго алей.
15 І назваў Якуб імя месца, на якім Бог гаварыў з ім, Бэтэль.
16 І вырушыў з Бэтэлю. І быў яшчэ кавалак зямлі, каб прыйсьці да Эфраты; і нарадзіла Рахель,
і цяжкія былі роды.
17 І сталася, што яна нараджала з вялікім болем, і сказала ёй павітуха: «Ня бойся, бо таксама
гэта сын у цябе».
18 І сталася, калі выходзіла з яе душа, бо яна паміралa, яна назвала імя ягонае Бэн-Оні, а бацька
ягоны назваў яго Бэн'ямін.
19 І памерла Рахель, і была пахаваная пры дарозе ў Эфрату, гэта Бэтлеем.
20 І паставіў Якуб слуп над магілай ейнай. Гэта слуп магільны Рахелі да сёньня.
21 І вырушыў [адтуль] Ізраіль, і паставіў намёт свой за Мігдаль-Эдэрам.
22 І сталася, калі жыў Ізраіль у зямлі той, пайшоў Рубэн, і лёг з Більгай, наложніцай бацькі
свайго. І пачуў [пра гэта] Ізраіль. І было сыноў Якуба дванаццаць.
23 Сыны Леі: першародны Якуба Рубэн, Сымон, Левій, Юда, Ісахар і Завулён.
24 Сыны Рахелі: Язэп і Бэн'ямін.
25 І сыны Більгі, нявольніцы Рахелі: Дан і Нэфталі.
26 І сыны Зільпы, нявольніцы Леі: Гад і Асэр. Гэта сыны Якуба, якія нарадзіліся ў яго ў Падан-
Араме.
27 І прыйшоў Якуб да Ісаака, бацькі свайго, у Мамрэ, у Кірыят-Арбу, гэта значыць у Хеўрон, дзе
жылі Абрагам і Ісаак.
28 І было дзён Ісаака сто восемдзясят гадоў.
29 І супачыў Ісаак, і памёр, і быў далучаны да народу свайго, стары і насычаны днямі, і пахавалі
яго Эзаў і Якуб, сыны ягоныя.

Бц 36

1 І вось радавод Эзава, ён жа Эдом.

2 Эзаў узяў сабе жонак з дачок Ханаану: Аду, дачку Элёна Хета, і Агаліваму, дачку Аны, дачку
Цывеона Хівея,
3 і Басэмат, дачку Ізмаэля, сястру Наваёта.
4 І нарадзіла Ада Эзаву Эліфаза, а Басэмат нарадзіла Рэўэля,
5 а Агалівама нарадзіла Евуша, Яляма і Караха. Гэта сыны Эзава, якія нарадзіліся ў яго ў зямлі
Ханаан.
6 І ўзяў Эзаў жонак сваіх, і сыноў сваіх, і дочак сваіх, і ўсе душы дому свайго, і статкі свае, і ўсю
скаціну сваю, і ўсю маёмасьць сваю, якую ён прыдбаў у зямлі Ханаан, і пайшоў у іншую зямлю
ад аблічча Якуба, брата свайго,
7 бо была маёмасьць іхняя вялікая, каб яны маглі жыць разам, і не магла зямля вандраваньня
іхняга насіць іх з прычыны статкаў іхніх.
8 І пасяліўся Эзаў на гары Сэір, Эзаў, ён жа Эдом.
9 І вось радавод Эзава, бацькі Эдому на гары Сэір.
10 Вось імёны сыноў Эзава: Эліфаз, сын Ады, жонкі Эзава; Рэўэль, сын Басэмат, жонкі Эзава.
11 І былі сыны Эліфаза: Тэман, Амар, Цэфо, Гатам і Кеназ.
12 А Тымна была наложніцай Эліфаза, сына Эзава, і яна нарадзіла Эліфазу Амалека. Гэта сыны
Ады, жонкі Эзава.
13 І вось сыны Рэўэля: Нахат, Зэрах, Шамма і Міза. Гэтыя былі сынамі Басэмат, жонкі Эзава.
14 І вось сыны Агалівамы, дачкі Аны, дачкі Цывеона, жонкі Эзава. Яна нарадзіла Эзаву Евуша,
Яляма і Караха.
15 Вось князі сыноў Эзава. Сыны Эліфаза, першароднага Эзава: князь Тэман, князь Амар, князь
Цэфо, князь Кеназ,
16 князь Карах, князь Гатам, князь Амалек. Гэта князі Эліфаза ў зямлі Эдом, гэта сыны Ады.
17 А вось сыны Рэўэля, сына Эзава: князь Нагат, князь Зэрах, князь Шамма, князь Міза. Гэта
князі Рэўэля ў зямлі Эдом, гэта сыны Басэмат, жонкі Эзава.
18 А вось сыны Агалівамы, жонкі Эзава: князь Евуш, князь Ялям, князь Карах. Гэта князі
Агалівамы, дачкі Аны, жонкі Эзава.
19 Вось сыны Эзава, і вось князі іхныя. Гэта Эдом.
20 Вось сыны Сэіра Харэя, жыхары зямлі той: Лётан, Шаваль, Цывеон, Ана,
21 Дышон, Эцэр і Дышан. Гэта князі Харэяў, сыны Сэіра ў зямлі Эдом.
22 І былі сыны Лётана: Хоры і Геман, а сястра Лётана — Тымна.
23 А вось сыны Шаваля: Альван, Манахат, Эваль, Шэфо і Анам.
24 А вось сыны Цывеона: Ая і Ана. Гэта той Ана, які знайшоў гарачыя крыніцы ў пустыні, калі
пасьвіў аслоў Цывеона, бацькі свайго.
25 А вось сыны Аны: Дышон і Агалівама, дачка Аны.
26 А вось сыны Дышона: Хемдан, Эшбан, Ітран, і Херан.
27 Вось сыны Эцэра: Більган, Зааван і Акан.
28 Вось сыны Дышана: Уц і Аран.
29 Вось князі Харэяў: князь Лётан, князь Шаваль, князь Цывеон, князь Ана,
30 князь Дышон, князь Эцэр, князь Дышан. Гэта князі Харэяў паводле княстваў сваіх у зямлі
Сэір.
31 А вось валадары, якія валадарылі ў зямлі Эдом, раней за валадараньне валадароў у сыноў
Ізраіля.
32 І валадарыў у Эдоме Бэла, сын Бэора, а імя гораду ягонага — Дынгава.
33 І памёр Бэла, і валадарыў пасьля яго Ёваў, сын Зэраха, з Боцры.
34 І памёр Ёваў, і валадарыў пасьля яго Хушам, з зямлі Тэман.
35 І памёр Хушам, і валадарыў пасьля яго Гадад, сын Бэдада, які пабіў Мадыянцаў на полі
Мааўскім; а імя гораду ягонага — Авіт.
36 І памёр Гадад, і валадарыў пасьля яго Самла з Масрэкі.
37 І памёр Самла, і валадарыў пасьля яго Шауль з Рэхавота, што каля ракі.
38 І памёр Шауль, і валадарыў пасьля яго Баал-Ханан, сын Ахбора.

39 І памёр Баал-Ханан, сын Ахбора, і валадарыў пасьля яго Гадар, а імя гораду ягонага — Паў;
а імя жонкі ягонае — Мэгетавэль, дачка Матрэды, дачкі Мэзагава.
40 А вось імёны князёў Эзава, паводле плямёнаў іхніх, паводле мясцовасьцяў іхніх, [названых]
імёнамі іхнімі: князь Тымна, князь Альва, князь Етэт,
41 князь Агалівама, князь Эла, князь Пінон,
42 князь Кеназ, князь Тэман, князь Міўцар,
43 князь Магдыель, князь Ірам. Вось князі Эдому, паводле сялібаў іхніх, у зямлі ўласнасьці
іхняй. Гэта Эзаў, бацька Эдому.

Бц 37

1 І жыў Якуб у зямлі вандраваньня бацькі свайго, у зямлі Ханаан.
2 Вось радавод Якуба. Язэп, маючы сямнаццаць гадоў, пасьвіў авечкі з братамі сваімі. І быў
ён юнаком, разам з сынамі Більгі і сынамі Зільпы, жонак бацькі свайго. І прыносіў Язэп ліхія
весткі пра іх да бацькі іхняга.
3 А Ізраіль любіў Язэпа больш за ўсіх сыноў сваіх, бо ён быў сын старасьці ягонай; і ён справіў
яму каляровую шату.
4 І ўбачылі браты ягоныя, што бацька іхні любіць яго больш за ўсіх братоў, і зьненавідзелі яго,
і не маглі гаварыць з ім спакойна.
5 І сьніў Язэп сон, і расказаў братам сваім, і яны яшчэ больш зьненавідзелі яго.
6 І ён сказаў ім: «Паслухайце, калі ласка, сон гэты, які я сьніў.
7 І вось, мы вяжам снапы сярод поля; і вось, устаў сноп мой, і так стаяў; і вось, абступілі яго
снапы вашыя і пакланіліся снапу майму».
8 І сказалі яму браты ягоныя: «Няўжо валадарачы, ты будзеш валадарыць над намі? Ці,
пануючы, будзеш панаваць над намі?» І яшчэ больш зьненавідзелі яго за сны ягоныя і за словы
ягоныя.
9 І сьніў ён яшчэ другі сон, і расказаў яго братам сваім, і сказаў: «Вось, я сьніў яшчэ сон. І вось,
сонца, і месяц, і адзінаццаць зорак кланяліся мне».
10 І ён распавёў бацьку свайму і братам сваім; і насварыўся на яго бацька ягоны, і сказаў яму:
«Што гэта за сон, які ты сьніў? Ці ж прыходзячы, прыйду я, і маці твая, і браты твае, каб
пакланіцца табе да зямлі?»
11 І зайздросьцілі яму браты ягоныя, а бацька ягоны захоўваў гэтае слова.
12 І пайшлі браты ягоныя пасьвіць авечкі бацькі свайго ў Сыхем.
13 І сказаў Ізраіль Язэпу: «Ці ж браты твае ня пасьвяць у Сыхеме? Ідзі, я пашлю цябе да іх». А
ён сказаў яму: «Вось я!»
14 І сказаў яму: «Пайдзі, прашу, паглядзі, ці ў супакоі браты твае і ці ў супакоі авечкі, і прынясі
мне вестку». І паслаў яго з даліны Хеўрон; і ён пайшоў у Сыхем.
15 І знайшоў яго [нейкі] чалавек, а вось, ён блукаў у полі, і спытаўся ў яго той чалавек, кажучы:
«Што шукаеш?»
16 А ён сказаў: «Я шукаю братоў маіх. Прашу, скажы мне, дзе яны пасьвяць?»
17 І сказаў чалавек той: «Яны вырушылі адсюль, бо я чуў, як яны казалі: “Хадзем у Датан”». І
пайшоў Язэп за братамі сваімі, і знайшоў іх у Датане.
18 І яны ўбачылі яго здалёк, перш, чым ён наблізіўся да іх, і змовіліся супраць яго, каб
усьмерціць яго.
19 І сказалі адзін да аднаго: «Вось, гэты гаспадар сноў ідзе.
20 І цяпер хадзем, і заб’ем яго, і кінем яго ў нейкую яму, і скажам: “Злы зьвер зьеў яго”, і
паглядзім, што будзе з ягоных сноў».
21 І пачуў [гэта] Рубэн, і выбавіў яго з рук іхніх, і сказаў: «Не забівайма душы».
22 І сказаў ім Рубэн: «Не разьлівайце крыві, кіньце яго ў гэтую яму, якая ў пустыні, а рукі не
выцягніце на яго», каб выбавіць яго ад рукі іхняй, каб вярнуць яго бацьку ягонаму.
23 І сталася, калі Язэп прыйшоў да братоў сваіх, яны зьнялі з Язэпа адзеньне ягонае, шату
каляровую, якая была на ім.
24 І ўзялі яго, і кінулі яго ў яму; а яма была пустая, не было ў ёй вады.

25 І селі яны есьці хлеб, і ўзьнялі вочы свае, і ўбачылі, і вось, караван Ізмаэльцаў ідзе з Гілеаду,
і вярблюды іхныя нясуць пахошчы, бальзам і ладан, ідучы, каб завезьці гэта ў Эгіпет.
26 І сказаў Юда братам сваім: «Якая карысьць, што мы заб'ем брата нашага і схаваем кроў
ягоную?
27 Пойдзем і прадамо яго Ізмаэльцам, і рукі нашыя няхай ня будуць на ім; бо ён — брат наш,
цела наша». І паслухалі [яго] браты ягоныя.
28 І праходзілі тыя людзі, купцы Мадыянскія, а яны выцягнулі Язэпа з ямы, і прадалі Язэпа
Ізмаэльцам за дваццаць срэбнікаў; і тыя завялі Язэпа ў Эгіпет.
29 І вярнуўся Рубэн да ямы, і вось, няма Язэпа ў яме. І разарваў ён адзеньне сваё,
30 і вярнуўся да братоў сваіх, і сказаў: «Хлопца няма, а я, куды я пайду?»
31 І ўзялі яны шату Язэпа, і зарэзалі казла, і намачылі шату ў крыві,
32 і паслалі шату каляровую, і прынесьлі бацьку свайму, і сказалі: «Гэта мы знайшлі. Спраўдзь,
просім, ці гэта адзеньне сына твайго, ці не?»
33 І ён пазнаў яго, і сказаў: «Шаты сына майго. Дзікі зьвер зьеў яго, разьдзіраючы; разьдзёрты
Язэп».
34 І разарваў Якуб адзеньне сваё, і апрануў зрэбніцу на сьцёгны свае, і плакаў па сыне сваім
шмат дзён.
35 І ўсталі ўсе сыны ягоныя, і ўсе дочкі ягоныя, каб пацешыць яго, але ён адмаўляўся
пацешыцца, і казаў: «Бо зыйду да сына майго са смуткам у апраметную». І плакаў па [Язэпе]
бацька ягоны.
36 А Мадыянцы прадалі яго ў Эгіпце Патыфару, урадоўцу фараона, начальніку варты.

Бц 38

1 І сталася ў той час, і зыйшоў Юда ад братоў сваіх, і паставіў [намёт свой] у аднаго Адулямца,
імя якога — Хіра.
2 І ўбачыў там Юда дачку аднаго Хананейца, імя якога — Шуа, і ўзяў яе, і ўвайшоў да яе.
3 І яна зачала, і нарадзіла сына; і ён назваў імя ягонае Ер.
4 І зачала яна зноў, і нарадзіла сына, і назвала імя ягонае Анан.
5 І яшчэ дадала, і нарадзіла сына, і назвала імя ягонае Шэля. Яна была ў Хезіве, калі нарадзіла
яго.
6 І ўзяў Юда жонку для Ера, першароднага свайго, імя якой — Тамар.
7 І быў Ер, першародны Юды, ліхі ў вачах ГОСПАДА, і ўсьмерціў яго ГОСПАД.
8 І сказаў Юда Анану: «Увайдзі да жонкі брата свайго, і споўні абавязак швагра з ёю, і ўзнаві
насеньне брату свайму».
9 І ведаў Анан, што не яму будзе насеньне; і было, што калі ён уваходзіў да жонкі брата свайго,
выліваў на зямлю, каб ня даць насеньня брату свайму.
10 І было ліхім у вачах ГОСПАДА тое, што ён рабіў; і Ён таксама ўсьмерціў яго.
11 І сказаў Юда Тамар, нявестцы сваёй: «Застанься ўдавою ў доме бацькі свайго, пакуль
вырасьце Шэля, сын мой». Бо ён сказаў: «Каб не памёр таксама ён, як браты ягоныя». І пайшла
Тамар, і жыла ў доме бацькі свайго.
12 І прайшло шмат дзён, і памерла дачка Шуа, жонка Юды. І суцешыўся Юда [пасьля жалобы],
і ўзыйшоў у Тымну да стрыгачоў авечак сваіх, сам і Хіра Адулямец, таварыш ягоны.
13 І паведамілі Тамар, кажучы: «Вось, сьвёкар твой узыходзіць у Тымну стрыгчы авечак сваіх».
14 І яна скінула з сябе ўдовінае адзеньне сваё, і засланілася вэлюмам, і, захінуўшыся, села каля
ўваходу ў Энаім, які на дарозе да Тымны, бо бачыла, што Шэля вырас, а яна ня дадзена яму за
жонку.
15 І ўбачыў яе Юда, і падумаў, што яна — блудніца, бо яна закрыла аблічча сваё.
16 І ён павярнуў да яе з дарогі, і сказаў: «Дазволь, прашу, увайду да цябе». Бо ён ня ведаў, што
яна — нявестка ягоная. А яна сказала: «Што ты дасі мне, калі ўвойдзеш да мяне?»
17 І ён сказаў: «Я прышлю табе казьляня з чарады». А яна сказала: «Ці дасі мне заруку, пакуль
прышлеш [яго]».

18 І ён сказаў: «Якую заруку даць табе?» А яна сказала: «Пячатку тваю, і пас твой, і кій твой,
які ў руцэ тваёй». І ён даў ёй, і ўвайшоў да яе; і яна зачала яму.
19 І ўстала, і пайшла, і зьняла вэлюм свой з сябе, і апранулася ва ўдовіны шаты.
20 І паслаў Юда казьляня праз рукі таварыша свайго Адулямца, каб узяць заруку з рукі
жанчыны, але ён не знайшоў яе.
21 І пытаўся ён у людзей месца таго, кажучы: «Дзе блудніца, якая ў Энаіме пры дарозе?» А
яны казалі: «Тут не было блудніцы».
22 І вярнуўся ён да Юды, і сказаў: «Я не знайшоў яе; і таксама людзі таго месца казалі: “Тут не
было блудніцы”».
23 І сказаў Юда: «Няхай яна возьме [заруку] сабе, каб толькі не было з нас кпінаў; вось, я паслаў
казьляня гэтае, а ты не знайшоў яе».
24 І сталася, што праз тры месяцы паведамілі Юдзе, кажучы: «Чужаложыла Тамар, нявестка
твая, і нават яна цяжарная ад распусты». І сказаў Юда: «Вывядзіце яе, і няхай будзе спаленая».
25 Яе павялі [на спаленьне], а яна паслала да сьвёкра свайго, кажучы: «Ад чалавека, якога
гэтыя [рэчы], я цяжарная». І сказала: «Пазнавай, чыя пячатка, і пас, і кій вось гэтыя».
26 І пазнаў [іх] Юда, і сказаў: «Яна больш праведная, чым я, бо я ня даў яе Шэлі, сыну свайму».
І больш не пазнаваў яе.
27 І сталася ў часе родаў ейных, і вось, блізьняты ў жываце ейным.
28 І сталася пры родах, і высунуў [адзін] ручку; і ўзяла павітуха, і завязала на ручку яму
чырвоную нітку, кажучы: «Гэты выйшаў першы».
29 І сталася, што схавалася рука ягоная, і вось, выйшаў брат ягоны. І яна сказала: «Як ты
прарваў перагароду?». І назвала імя ягонае Пэрэс.
30 А потым выйшаў брат ягоны, у якога на руцэ чырвоная нітка. І назвала імя ягонае Зарах.

Бц 39

1 А Язэп быў заведзены ў Эгіпет, і купіў яго Патыфар, урадовец фараона, начальнік варты,
Эгіпцянін, з рук Ізмаэльцаў, якія завялі яго туды.
2 І быў ГОСПАД з Язэпам, і стаўся ён чалавекам, які мае посьпех, і быў у доме гаспадара свайго,
Эгіпцяніна.
3 І бачыў гаспадар ягоны, што ГОСПАД з ім, і ўсяму, што ён робіць, ГОСПАД дае посьпех у руках
ягоных.
4 І знайшоў Язэп ласку ў вачах ягоных, і служыў яму, і ён паставіў яго над домам сваім, і ўсё,
што меў, аддаў у рукі ягоныя.
5 І сталася, што ад таго часу, як ён паставіў яго над домам сваім і над усім, што меў, ГОСПАД
дабраславіў дом Эгіпцяніна дзеля Язэпа, і было дабраславеньне ГОСПАДА на ўсім, што меў ён
у доме і ў полі.
6 І аддаў ён усё, што меў, у рукі Язэпа; і ня рупіўся ні пра што, акрамя хлеба, які ён еў. А Язэп
меў зграбную постаць і прывабны выгляд.
7 І сталася пасьля гэтых падзеяў, і ўзьняла жонка гаспадара ягонага вочы свае на Язэпа, і
сказала: «Ляж са мною».
8 Але ён адмовіўся, і сказаў жонцы гаспадара свайго: «Вось, гаспадар мой ня рупіцца пры мне
ні пра што ў доме, і ўсё, што мае, аддаў у руку маю.
9 Няма нікога, важнейшага за мяне, у доме гэтым; і ён не забараняе мне нічога, акрамя толькі
цябе, бо ты — жонка ягоная. І як я магу ўчыніць такое вялікае злачынства і зграшыць супраць
Бога».
10 І сталася, што яна зьвярталася да Язэпа штодня, а ён ня слухаў яе, каб легчы каля яе, і быць
з ёю.
11 І сталася аднаго дня, і ён увайшоў у дом рабіць працу сваю, і нікога з людзей дому не было
ў доме.
12 І яна схапіла яго за адзеньне ягонае, кажучы: «Ляж са мною». Але ён пакінуў адзеньне сваё
ў руцэ ейнай, і ўцёк, і выйшаў навонкі.
13 І сталася, калі яна ўбачыла, што ён пакінуў адзеньне сваё ў руцэ ейнай і выбег навонкі,

14 яна паклікала людзей дому свайго, і сказала ім, кажучы: «Гляньце, прывялі да нас Гебрая,
каб ён сваволіў у нас. Ён прыйшоў да мяне, каб легчы са мною, і я закрычала голасам вялікім.
15 І сталася, калі ён пачуў, што я ўзьняла голас мой і закрычала, ён пакінуў адзеньне сваё ў
мяне, і ўцёк, і выйшаў навонкі».
16 І пакінула адзеньне ягонае ў сябе да прыходу гаспадара ягонага да дому свайго.
17 І гаварыла з ім гэткімі словамі, кажучы: «Прыйшоў да мяне гэты нявольнік Гебрай, якога
ты прывёў да нас, каб сваволіць са мною.
18 І сталася, калі я ўзьняла голас мой і закрычала, ён пакінуў адзеньне сваё ў мяне і ўцёк
навонкі».
19 І сталася, што пачуў гаспадар ягоны словы жонкі сваёй, якія яна гаварыла яму, кажучы:
«Гэткую рэч учыніў мне нявольнік твой!», і ўзгарэўся гнеў ягоны.
20 І ўзяў гаспадар Язэпаў яго, і кінуў яго ў вязьніцу, месца, дзе былі ўвязьнены вязьні валадара.
І быў ён там у вязьніцы.
21 І быў ГОСПАД з Язэпам, і зьявіў да яго міласэрнасьць, і даў ласку яму ў вачах начальніка
вязьніцы.
22 І аддаў начальнік вязьніцы ў руку Язэпу ўсіх вязьняў, якія былі ў вязьніцы, і ўсё, што там
рабілі, ён рабіў.
23 Не пільнаваў начальнік вязьніцы нічога, што было ў руках ягоных, бо ГОСПАД быў з ім, і ў
тым, што ён рабіў, ГОСПАД даваў посьпех.

Бц 40

1 І сталася пасьля гэтых падзеяў, саграшылі чашнік валадара Эгіпецкага і пекар перад панам
сваім, перад валадаром Эгіпецкім.
2 І загневаўся фараон на двух урадоўцаў сваіх, на начальніка чашнікаў і на начальніка пекараў,
3 і аддаў іх пад варту ў дом начальніка варты, у вязьніцу, месца, дзе Язэп быў вязьнем.
4 І прызначыў начальнік варты Язэпа да іх, і ён служыў ім. І былі яны шмат дзён пад вартаю.
5 І сьнілі ў адну ноч яны абодва кожны свой сон, кожны [сьніў] са значэньнем сон свой, чашнік
і пекар, якія былі ў валадара Эгіпецкага і якія былі ўвязьненыя ў вязьніцы.
6 І прыйшоў да іх Язэп раніцай, і ўбачыў іх, і вось, яны засмучаныя.
7 І спытаўся ён у ўрадоўцаў фараона, што былі пад вартаю з ім у доме пана ягонага, кажучы:
«Чаму абліччы вашыя сёньня [маюць] благі выгляд?»
8 І сказалі яны яму: «Сьнілі мы сон, а растлумачыць [яго] няма каму». І сказаў ім Язэп: «Ці ж
ня ў Бога тлумачэньне [сну]? Распавядзіце мне».
9 І распавёў начальнік чашнікаў сон свой Язэпу, і сказаў яму: «У сьне маім, вось, вінаградная
лаза перада мною.
10 І на вінаграднай лазе — тры галінкі. І яна, калі вырасла, расквітнела квеценьню сваёй,
насьпелі гронкі вінаграду ейнага.
11 І келіх фараона ў руцэ маёй, і я ўзяў вінаградныя ягады, і выціснуў іх у келіх фараона, і даў
келіх у рукі фараона».
12 І сказаў яму Язэп: «Гэта тлумачэньне [сну]: тры галінкі — гэта тры дні.
13 Праз тры дні падыме фараон галаву тваю, і верне цябе на месца тваё, і ты будзеш даваць
келіх фараону ў руку ягоную паводле ранейшага звычаю, калі ты быў чашнікам ягоным.
14 Толькі ўзгадай пра мяне, калі будзе табе добра; і зьяві мне міласэрнасьць, узгадай пра мяне
перад фараонам, і вывядзі мяне з гэтага дому,
15 бо я крадзьма ўкрадзены з зямлі Гебраяў, і таксама тут нічога не зрабіў, за што б пасадзіць
мяне ў вязьніцу».
16 І ўбачыў начальнік пекараў, што ён добра патлумачыў, і сказаў Язэпу: «Я таксама сьніў, і
вось, тры кашы плеценыя на галаве маёй.
17 І ў кашы верхнім — усялякая ежа фараона, выробленая пекарам; і птушкі елі яе з каша на
галаве маёй».
18 І адказаў Язэп, і сказаў: «Гэта тлумачэньне [сну]: тры кашы — гэта тры дні.

19 Праз тры дні здыме фараон галаву з цябе, і павесіць цябе на дрэве; і птушкі будуць есьці
цела тваё з цябе».
20 І праз тры дні быў дзень нараджэньня фараона, і ён справіў бяседу для ўсіх слугаў сваіх, і
падняў галаву начальніка чашнікаў і галаву начальніка пекараў сярод слугаў сваіх.
21 І вярнуў [фараон] начальніка чашнікаў на ягонае месца чашніка, і ён даў келіх у руку
фараону,
22 а начальніка пекараў павесіў, як патлумачыў ім Язэп.
23 І не ўзгадаў начальнік чашнікаў пра Язэпа, і забыўся на яго.

Бц 41

1 І сталася, што мінула два гады часу, і сьніў фараон, і вось, ён стаіць каля ракі.
2 І вось, з ракі выходзяць сем кароваў прыгожых з выгляду і сытых целам; і пасьвіліся на
поплаве.
3 І вось, сем іншых кароваў выходзяць за імі з ракі, брыдкіх з выгляду і худых целам, і сталі
каля тых кароваў на беразе ракі.
4 І пажэрлі каровы брыдкія з выгляду і худыя целам сем кароваў прыгожых з выгляду і сытых.
І прачнуўся фараон.
5 І ён заснуў, і сьніў другі раз, і вось, сем каласоў вырасьлі на адной сьцябліне, здаровых і
добрых.
6 І вось, сем каласоў пустых і высушаных усходнім ветрам вырастаюць пасьля іх.
7 І праглынулі каласы пустыя сем каласоў здаровых і поўных. І прачнуўся фараон, і вось, [гэта]
сон.
8 І сталася раніцаю, што быў устрывожаны дух ягоны, і ён паслаў, і паклікаў усіх варажбітоў
Эгіпту і ўсіх мудрацоў яго, і распавёў ім фараон сон свой; і не было [нікога], хто б патлумачыў
яго фараону.
9 І прамовіў начальнік чашнікаў фараону, кажучы: «Грахі мае ўзгадваю я сёньня.
10 Фараон загневаўся на слугаў сваіх і аддаў мяне пад нагляд у дом начальніка варты, мяне і
начальніка пекараў.
11 І мы сьнілі сон у адну ноч, я і ён, кожны са значэньнем сон свой мы сьнілі.
12 І быў там з намі юнак Гебрай, нявольнік начальніка варты. І мы распавялі яму, і ён
патлумачыў нам сны нашыя, кожнаму сон ягоны патлумачыў.
13 І сталася, што як ён патлумачыў нам, так і адбылося: мяне вярнулі на становішча маё, а
таго павесілі».
14 І паслаў фараон, і паклікаў Язэпа; і хутка вывялі яго з лёху. І ён пагаліўся, і зьмяніў адзеньне
сваё, і прыйшоў да фараона.
15 І сказаў фараон Язэпу: «Я сьніў сон, і няма нікога, хто б патлумачыў яго. І я чуў, што пра
цябе кажуць, што ты, выслухаўшы сон, тлумачыш яго».
16 І адказаў Язэп фараону, кажучы: «Ня я, але Бог можа казаць на супакой фараону».
17 І сказаў фараон Язэпу: «У сьне маім, вось, стаю я на беразе ракі.
18 І вось, з ракі выходзяць сем кароваў сытых целам і прыгожых з выгляду, і пасьвіліся яны на
поплаве.
19 І вось, сем кароваў іншых выходзяць пасьля іх, някшталтныя, вельмі брыдкія з выгляду і
худыя целам, я ня бачыў падобных, што да брыдкасьці, у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
20 І пажэрлі каровы худыя і брыдкія першых сем кароваў сытых.
21 І ўвайшлі яны ў чэравы іхныя, і не было пазнаць, што яны ўвайшлі ў чэравы іхныя, і выгляд
іхні быў паганы, як і спачатку. І я прачнуўся.
22 І ўбачыў я ў сьне, і вось, сем каласоў вырастаюць на адной сьцябліне, поўных і добрых.
23 І вось, сем каласоў ценькіх, пустых і высушаных усходнім ветрам растуць пасьля іх.
24 І праглынулі каласы пустыя сем каласоў добрых. Я расказаў гэта варажбітам, але няма
[нікога, хто б] патлумачыў [гэта] мне».
25 І сказаў Язэп фараону: «Сон фараона — адзін ён. Што Бог зробіць, Ён паведаміў фараону.

26 Сем кароваў добрых — гэта сем гадоў; і сем тых каласоў добрых — гэта сем гадоў. Гэта сон
адзін.
27 І сем кароваў худых і брыдкіх, якія выйшлі пасьля іх — гэта сем гадоў; і сем каласоў пустых,
высушаных усходнім ветрам — гэта будзе сем гадоў голаду.
28 Гэта слова, якое я прамовіў да фараона. Што Бог зробіць, Ён паказаў фараону.
29 Вось, прыйдзе сем гадоў вялікага дабрабыту ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
30 І настануць пасьля іх сем гадоў голаду; і забудзецца ўвесь той дабрабыт у зямлі Эгіпецкай,
і вынішчыць голад гэтую зямлю.
31 І ня будзе відно дабрабыту ў зямлі з прычыны голаду, які будзе пасьля, бо будзе ён вельмі
цяжкі.
32 А тое, што паўтарыўся гэты сон фараону двойчы, [азначае], што вызначана гэта справа ў
Бога і неўзабаве Бог зьдзейсьніць гэта.
33 І цяпер няхай прыгледзіць фараон мужа кемлівага і мудрага, і няхай паставіць яго над
зямлёю Эгіпецкай.
34 Няхай [так] зробіць фараон, і прызначыць наглядчыкаў над краем, і зьбірае пятую частку
[ўраджаю] з зямлі Эгіпецкай у сем гадоў дабрабыту.
35 І зьбяруць усякае харчаваньне падчас гэтых добрых гадоў, якія надыйдуць, і няхай
зьбіраюць збожжа пад руку фараона на харчаваньне ў гарадах, і няхай захоўваюць.
36 І будзе гэтае харчаваньне на запас зямлі на сем гадоў голаду».
37 І добрае было гэтае слова ў вачах фараона і ў вачах усіх слугаў ягоных.
38 І сказаў фараон слугам сваім: «Ці знойдзецца такі чалавек, як гэты, які мае ў сабе Духа
Божага?»
39 І сказаў фараон Язэпу: «Пасьля таго, як Бог паведаміў табе ўсё гэта, няма нікога такога
кемлівага і мудрага, як ты.
40 Ты будзеш над домам маім, і вуснаў тваіх будзе слухацца ўвесь народ мой; толькі пасадам
я буду перавышаць цябе».
41 І сказаў фараон Язэпу: «Глядзі, я паставіў цябе над усёй зямлёю Эгіпецкай».
42 І зьняў фараон пярсьцёнак свой з рукі сваёй, і даў яго на руку Язэпу; і апрануў яго ў адзеньне
з вісону, і ўзлажыў ланцуг залаты на шыю ягоную;
43 і загадаў вазіць яго на другой калясьніцы сваёй, і крычалі перад ім: «Кланяйцеся!» І
паставіў яго над усёй зямлёю Эгіпецкай.
44 І сказаў фараон Язэпу: «Я — фараон, але без цябе ніхто не падыме рукі сваёй і нагі сваёй
у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай».
45 І назваў фараон імя Язэпава Цафнат-Панэах, і даў яму за жонку Аснат, дачку Паты-Пэра,
сьвятара з Ону. І ўзьняўся Язэп над зямлёю Эгіпецкаю.
46 Язэпу было трыццаць гадоў, калі ён стаў перад фараонам, валадаром Эгіпту. І выйшаў Язэп
ад аблічча фараона, і прайшоў па ўсёй зямлі Эгіпецкай.
47 І выдала зямля ў сем гадоў дабрабыту поўныя жмені [збожжа].
48 І зьбіраў ён усякае харчаваньне тых сямі гадоў, якія былі ў зямлі Эгіпецкай, і разьмясьціў
харчаваньне ў гарадах; харчаваньне з вакалічных палёў гораду ён складаў у [кожным з] іх.
49 І назьбіраў Язэп збожжа, як пяску марскога, так шмат, ажно перасталі лічыць, бо не было
[яму] ліку.
50 І ў Язэпа нарадзіліся два сыны перш, чым прыйшоў год голаду, якіх нарадзіла яму Аснат,
дачка Паты-Пэра, сьвятара з Ону.
51 І назваў Язэп імя першароднага Манаса, бо [казаў:] «Даў мне Бог забыцца ўсе цяжкасьці мае
і ўвесь дом бацькі майго».
52 А імя другога назваў Эфраім, бо казаў: «Распладзіў мяне Бог у зямлі нядолі маёй».
53 І мінулі сем гадоў дабрабыту, які быў у зямлі Эгіпецкай.
54 І пачалі прыходзіць сем гадоў голаду, як сказаў Язэп. І быў голад у-ва ўсіх краінах, але ў-ва
ўсёй зямлі Эгіпецкай быў хлеб.

55 І галадавала ўся зямля Эгіпецкая, і крычаў народ да фараона пра хлеб, і сказаў фараон усім
Эгіпцянам: «Ідзіце да Язэпа і рабіце, што ён вам скажа».
56 І быў голад на ўсім абліччы зямлі, і адчыніў Язэп усе [гумны], якія былі ў іх, і прадаваў
Эгіпцянам. І павялічваўся голад у зямлі Эгіпецкай.
57 І з усёй зямлі прыходзілі ў Эгіпет купляць у Язэпа, бо павялічваўся голад па ўсёй зямлі.

Бц 42

1 І ўбачыў Якуб, што ёсьць збожжа ў Эгіпце, і сказаў Якуб сынам сваім: «Што вы паглядаеце
[адзін на аднаго]?»
2 І сказаў: «Вось, я чуў, што ёсьць збожжа ў Эгіпце. Зыйдзіце туды і купіце для нас там, і будзем
жыць, і не памром».
3 І зыйшлі дзесяць братоў Язэпавых купіць збожжа ў Эгіпце.
4 А Бэн'яміна, брата Язэпа, не паслаў Якуб з братамі ягонымі, бо сказаў: «Каб не здарылася з
ім няшчасьце».
5 І прыйшлі сыны Ізраіля купляць збожжа разам з тымі, што прыйшлі [туды], бо быў голад у
зямлі Ханаан.
6 А Язэп кіраваў у той зямлі, ён продаў збожжа ўсім людзям зямлі. І прыйшлі браты Язэпа, і
пакланіліся яму тварам да зямлі.
7 І ўбачыў Язэп братоў сваіх, і пазнаў іх, і ўдаваў, што ён чужы ім, і размаўляў з імі сувора, і
сказаў ім: «Адкуль вы прыйшлі?» І яны сказалі: «З зямлі Ханаан, каб купіць харчоў».
8 І пазнаў Язэп братоў сваіх, а яны не пазналі яго.
9 І ўзгадаў Язэп сны, якія ён сьніў пра іх, і сказаў ім: «Шпегі вы, вы прыйшлі, каб агледзець
голасьць зямлі гэтай».
10 І сказалі яны яму: «Не, пане. Слугі твае прыйшлі купіць харчаваньне.
11 Усе мы — сыны аднаго чалавека, шчырыя мы. Не былі слугі твае шпегамі».
12 Але ён сказаў ім: «Не, бо вы прыйшлі агледзець голасьць зямлі гэтай».
13 А яны сказалі: «Дванаццаць слугаў тваіх, браты [мы]. Мы — сыны аднаго чалавека ў зямлі
Ханаан, і вось, наймалодшы сёньня з бацькам нашым, а аднаго няма».
14 І сказаў ім Язэп: «Гэта я сказаў вам, кажучы: "Вы — шпегі".
15 Таму будзеце выспрабаваныя. Няхай жыве фараон! Вы ня выйдзеце адгэтуль, пакуль ня
прыйдзе сюды наймалодшы брат ваш.
16 Пашліце аднаго з вас, і няхай ён возьме брата вашага; а вы будзеце ўвязьненыя. І
выспрабуюцца словы вашыя, ці праўда ваша. А калі не, няхай жыве фараон! Вы — шпегі».
17 І ўзяў іх пад варту на тры дні.
18 І сказаў ім Язэп на трэці дзень: «Гэта зрабіце, і будзеце жывыя. Бо я баюся Бога.
19 Калі вы — шчырыя, адзін брат ваш застанецца ўвязьнены ў доме, у якім вы пад вартаю, а вы
ідзіце, занясіце збожжа дзеля [заспакаеньня] голаду дамоў вашых.
20 І брата вашага малодшага прывядзіце да мяне, і спраўдзяцца словы вашыя, і вы не памраце».
І яны зрабілі так.
21 І казалі яны кожны брату свайму: «Сапраўды, мы вінаватыя адносна брата нашага, што мы
бачылі гора душы ягонай, як ён маліў нас, але мы не паслухалі, і за тое прыйшла на нас бяда
гэтая».
22 І адказаў ім Рубэн, кажучы: «Ці не казаў я вам, кажучы: "Не грашыце супраць хлопца", а вы
не паслухалі; і вось, за кроў ягоную помсьціцца».
23 І яны ня ведалі, што Язэп разумее, бо паміж імі быў перакладчык.
24 І [Язэп] адвярнуўся ад іх, і плакаў. І павярнуўся да іх, і размаўляў з імі, і ўзяў з іх Сымона, і
зьвязаў яго перад вачыма іхнімі.
25 І загадаў Язэп, каб напоўнілі мяхі іхнія збожжам, і вярнулі срэбра іхняе кожнаму ў мех
ягоны, і далі ім ежу на дарогу. І зрабілі ім гэтак.
26 І яны ўсклалі збожжа сваё на аслоў сваіх, і пайшлі адтуль.
27 І разьвязаў адзін [з іх] мех свой, каб пакарміць асла свайго на папасе; і ўбачыў срэбра сваё,
і вось, яно ў адтуліне мяха ягонага.

28 І сказаў ён братам сваім: «Вярнулі срэбра маё, і вось, яно ў мяху маім». І ўстрывожылася
сэрца іхняе, і яны задрыжэлі, кажучы адзін аднаму: «Што гэта зрабіў нам Бог?»
29 І прыйшлі яны да Якуба, бацькі свайго, у зямлю Ханаан, і распавялі яму ўсё, што здарылася
з імі, кажучы:
30 «Гаварыў гэты чалавек, пан зямлі той, з намі сувора, і меў нас за шпегаў у зямлі той.
31 І сказалі мы яму: “Шчырыя мы, мы не былі шпегамі.
32 Нас дванаццаць братоў, сыны бацькі нашага; аднаго няма, а малодшы сёньня з бацькам
нашым у зямлі Ханаан”.
33 І сказаў гэты чалавек, пан зямлі той: “З гэтага я даведаюся, што вы шчырыя: аднаго брата
вашага пакіньце ў мяне, а вы вазьміце збожжа дзеля [заспакаеньня] голаду дамоў вашых і
ідзіце.
34 І прывядзіце да мяне малодшага брата вашага; і я даведаюся, што вы ня шпегі, але шчырыя
вы. Брата вашага аддам вам, і вы будзеце падарожнічаць у зямлі гэтай”».
35 І сталася, калі яны высыпалі мяхі свае, вось, у кожнага капшук са срэбрам ягоным у мяху
ягоным. І ўбачылі яны капшукі са срэбрам сваім, яны і бацька іхні, і спалохаліся.
36 І сказаў ім Якуб, бацька іхні: «Вы пазбавілі мяне дзяцей. Язэпа няма; і Сымона няма, і
Бэн’яміна [хочаце] ўзяць. Усё гэта [гора] на мяне прыйшло!»
37 І сказаў Рубэн бацьку свайму: «Забі двух сыноў маіх, калі я не прывяду яго да цябе. Аддай
яго ў рукі мае, і я вярну яго табе».
38 А ён сказаў: «Ня зыйдзе сын мой з вамі; бо брат ягоны памёр, і ён адзін застаўся! Калі
здарыцца з ім няшчасьце ў дарозе, у якую вы пойдзеце, вы зьвядзеце сівізну маю са смуткам
у апраметную».

Бц 43

1 А голад цяжэў на зямлі.
2 І сталася, што яны скончылі есьці збожжа, якое прывезьлі з Эгіпту, і сказаў ім бацька іхні:
«Вярніцеся, купіце нам трохі харчаваньня».
3 І сказаў яму Юда, кажучы: «Той чалавек сувора папярэдзіў нас, кажучы: “Ня ўбачыце аблічча
майго, калі ня [будзе] брат ваш з вамі”.
4 Калі згаджаешся паслаць брата нашага з намі, зыйдзем і купім табе харчаваньне.
5 А калі не пашлеш, ня зыйдзем, бо той чалавек сказаў нам: “Ня ўбачыце аблічча майго, калі
ня [будзе] брат ваш з вамі”».
6 І сказаў Ізраіль: «Навошта вы зрабілі мне ліха, сказаўшы таму чалавеку, што ў вас ёсьць яшчэ
брат?»
7 І сказалі яны: «Пытаючыся, распытаваў гэты чалавек пра нас, пра сям’ю нашую, кажучы: “Ці
яшчэ бацька ваш жывы? Ці ёсьць у вас брат?” І мы адказвалі яму паводле гэтых словаў. Ці
маглі мы ведаць, што ён скажа: “Прывядзіце брата вашага”».
8 І сказаў Юда Ізраілю, бацьку свайму: «Пашлі гэтага хлопца са мною; і мы ўстанем, і пойдзем,
і будзем жыць, і не памром, і мы, і ты, і дзеці нашыя.
9 Я паручаюся за яго, з рукі маёй будзеш вымагаць яго. Калі я не прывяду яго да цябе і не
пастаўлю перад абліччам тваім, буду я грэшны перад табою на ўсё жыцьцё.
10 Бо калі б мы не затрымліваліся, дык цяпер мы б ужо вярнуліся двойчы».
11 І сказаў ім Ізраіль, бацька іхні: «Калі так, тады зрабіце вось што: вазьміце пладоў зямлі ў
мяхі вашыя і занясіце гэтаму чалавеку дар, трохі бальзаму, і трохі мёду, і пахошчы, і ладан, і
фісташкі, і мігдалы.
12 І срэбра падвойна вазьміце ў рукі вашыя. І срэбра, якое назад [паложана] ў адтуліны мяхоў
вашых, вярніце рукамі сваімі; можа, гэта памылка.
13 І брата вашага бярыце, і, устаўшы, вярніцеся да чалавека таго.
14 А Бог Усемагутны няхай дасьць вам ласку перад абліччам таго чалавека, і ён выпусьціць вам
другога брата вашага і Бэн’яміна. А я, калі маю пазбыцца дзяцей, пазбудуся».

15 І ўзялі мужы гэтыя дары свае, і срэбра падвойнае ўзялі ў рукі свае, і Бэн'яміна, і ўсталі, і
зыйшлі ў Эгіпет, і сталі перад Язэпам.
16 І ўбачыў Язэп з імі Бэн'яміна, і сказаў загадчыку дому свайго: «Увядзі гэтых мужоў у дом, і
зарэж, што можна зарэзаць, і прыгатуй [ежу], бо са мною будуць есьці мужы гэтыя апоўдні».
17 І зрабіў той чалавек так, як сказаў Язэп, і ўвёў той чалавек мужоў гэтых у дом Язэпа.
18 І баяліся мужы гэтыя, што прывялі іх у дом Язэпа, і казалі: «Гэта з прычыны срэбра,
вернутага ўперад у мяхі нашыя, прывялі нас, каб накінуцца на нас, і напасьці на нас, і ўзяць у
няволю нас і аслоў нашых».
19 І наблізіліся яны да чалавека, які быў над домам Язэпа, і гаварылі з ім каля ўваходу ў дом,
20 і сказалі: «Паслухай, пане мой! Прыходзячы, прыходзілі мы [сюды] ўперад купіць
харчаваньне.
21 І сталася, калі мы прыйшлі на папас, і разьвязалі мяхі свае, і вось, срэбра кожнага ў адтуліне
мяха ягонага, срэбра нашае паводле вагі сваёй, і мы вяртаем яго рукамі сваімі.
22 І срэбра іншае мы прынесьлі ў руках сваіх, каб купіць харчаваньне. Мы ня ведаем, хто
паклаў срэбра нашае ў мяхі нашыя».
23 А ён сказаў: «Супакой вам! Ня бойцеся! Бог ваш і Бог бацькі вашага даў вам скарб у мяхах
вашых. Вашае срэбра прыйшло да мяне [ў свой час]». І вывеў да іх Сымона.
24 І ўвёў чалавек той мужоў гэтых у дом Язэпа, і даў вады, і яны абмылі ногі свае; і даў корм
аслам іхнім.
25 І яны прыгатавалі дары да прыходу Язэпа апоўдні, бо чулі, што там яны будуць есьці хлеб.
26 І прыйшоў Язэп у дом, і яны прынесьлі яму ў дом дары, якія ў руках іхніх, і пакланіліся яму
да зямлі.
27 І ён спытаўся ў іх пра супакой, і сказаў: «Ці добра маецца бацька ваш стары, пра якога вы
распавядалі? Ці ён яшчэ жыве?»
28 І сказалі яны: «Мае супакой слуга твой, бацька наш, ён яшчэ жыве». І схіліліся, і,
пакланяючыся, пакланіліся.
29 І ўзьняў ён вочы свае, і ўбачыў Бэн'яміна, брата свайго, сына маці сваёй, і сказаў: «Ці гэта
брат ваш наймалодшы, пра якога вы распавядалі мне?» І сказаў: «Бог няхай зьмілуецца над
табою, сыне мой».
30 І хутка выйшаў Язэп, бо ўзгарэліся пачуцьці ягоныя да брата ягонага, і ён шукаў [месца, каб]
плакаць; і ўвайшоў у пакой, і плакаў там.
31 І абмыў ён аблічча сваё, і выйшаў, і апанаваў сябе, і сказаў: «Пастаўце хлеб».
32 І паставілі яму асобна, і ім асобна, і Эгіпцянам, якія елі з ім, асобна, бо Эгіпцяне ня могуць
есьці з Гебраямі хлеб, бо гэта агіда для Эгіпту.
33 І селі яны перад ім, першародны паводле першароднасьці сваёй, і наймалодшы паводле
маладосьці сваёй, і зьдзіўляліся мужы гэтыя, [гледзячы] адзін на аднаго.
34 І падалі стравы ад яго аблічча для іх. І была страва для Бэн'яміна большая, чым стравы
кожнага з іх у пяць разоў. І яны пілі, і ўпіліся з ім.

Бц 44

1 І загадаў Язэп загадчыку дому свайго, кажучы: «Напоўні мяхі гэтых мужоў харчамі, колькі
яны могуць несьці, і палажы срэбра кожнага ў адтуліну мяха ягонага.
2 А келіх мой, келіх срэбны, палажы ў адтуліну мяха наймалодшага, і срэбра за збожжа
ягонае». І ён зрабіў паводле слова Язэпа, якое той сказаў.
3 Раніцаю разьвіднела, і гэтых мужоў выправілі, іх і аслоў іхніх.
4 Яны выйшлі з гораду, не адыйшлі далёка, і Язэп сказаў загадчыку дому свайго: «Устань,
ганіся за тымі людзьмі, і дагоніш іх, і скажаш ім: "Чаму вы адплацілі ліхам за дабро?
5 Ці ж ня гэта той келіх, з якога п'е пан мой, і прадказваючы, прадказвае на ім? Ліха вы ўчынілі,
гэтак зрабіўшы"».
6 І ён дагнаў іх, і прамовіў ім гэтыя словы.

7 А яны сказалі: «Навошта пан мой кажа такія словы? Далёкія слугі твае, каб учыніць гэткія
рэчы.
8 Тое срэбра, якое мы знайшлі ў адтулінах мяхоў сваіх, мы вярнулі табе з зямлі Ханаан. Як жа
мелі мы красьці з дому гаспадара твайго срэбра альбо золата?
9 У каго са слугаў тваіх будзе знойдзена гэта, той няхай памрэ, а мы таксама станем
нявольнікамі пана майго».
10 І ён сказаў: «Дык цяпер няхай будзе паводле словаў вашых. У каго будзе знойдзена гэта,
той стане мне нявольнікам, а вы будзеце нявінныя».
11 І яны пасьпяшаліся, і зьнялі кожны мех свой на зямлю, і разьвязалі кожны мех свой.
12 А ён шукаў, пачаўшы ад найстарэйшага і скончыўшы наймалодшым; і знайшоў келіх у мяху
Бэн'яміна.
13 І разарвалі яны адзеньні свае, і ўсклалі [мяхі] кожны на асла свайго, і вярнуліся ў горад.
14 І прыйшлі Юда і браты ягоныя ў дом Язэпа, а ён яшчэ быў там. І яны ўпалі перад абліччам
яго на зямлю.
15 І сказаў ім Язэп: «Што за ўчынак гэта вы ўчынілі? Ці ж вы ня ведалі, што, прадказваючы,
прадказвае такі чалавек, як я?»
16 І сказаў Юда: «Што нам сказаць, пане мой? Што нам гаварыць і як нам апраўдвацца? Бог
знайшоў правіну слугаў тваіх. Вось, мы — нявольнікі пана майго, і мы, і той, у чыіх руках быў
знойдзены келіх».
17 І сказаў [Язэп]: «Далёка ад мяне, каб я ўчыніў гэта. Той чалавек, у руках якога знойдзены
келіх, ён будзе нявольнікам маім, а вы ўзыходзьце ў супакоі да бацькі свайго».
18 І наблізіўся да яго Юда, і сказаў: «Паслухай, пане мой, няхай скажа, прашу, слуга твой слова
ў вушы пана свайго, і няхай не распальваецца гнеў твой на слугу твайго, бо ты — як сам фараон.
19 Пан мой пытаўся ў слугаў сваіх, кажучы: "Ці ёсьць у вас бацька альбо брат?"
20 І мы сказалі пану нашаму: "Ёсьць у нас бацька стары і дзіця старасьці [ягонае] малое, а брат
ягоны памёр, і ён адзін застаўся па маці сваёй, і бацька ягоны любіць яго".
21 І ты сказаў слугам тваім: "Прывядзіце яго да мяне, і я зьвярну вока маё на яго".
22 І мы сказалі пану майму: "Ня можа хлопец пакінуць бацьку свайго; і калі ён пакіне бацьку
свайго, дык той памрэ".
23 І сказаў ты слугам тваім: "Калі ня прыйдзе брат ваш наймалодшы з вамі, не дазволю вам
больш бачыць аблічча маё".
24 І сталася, што мы ўзыйшлі да слугі твайго, бацькі майго, і пераказалі яму словы пана майго.
25 І сказаў бацька наш: "Вярніцеся, купіце нам трохі харчаваньня".
26 І мы сказалі: "Ня можам зыйсьці. Калі будзе з намі брат наш наймалодшы, мы зыйдзем, бо
ня зможам убачыць аблічча таго чалавека, калі брата нашага наймалодшага ня будзе з намі".
27 І сказаў нам слуга твой, бацька наш: "Вы ведаеце, што двух нарадзіла мне жонка мая.
28 І адыйшоў адзін ад мяне, і я сказаў: "Напэўна, ён разьдзёрты [дзікім зьверам]", і я ня бачыў
яго дагэтуль.
29 І возьмеце таксама гэтага ад аблічча майго, і здарыцца з ім няшчасьце, і заведзіцё вы сівізну
маю ў горы ў апраметную".
30 І цяпер, як я прыйду да слугі твайго, бацькі майго, і хлопца няма з намі, а душа ягоная
прывязана да душы ягонай.
31 І станецца, што ён убачыць, што няма хлопца, і памрэ, і зьвядуць слугі твае сівізну слугі
твайго, бацькі нашага, са смуткам у апраметную.
32 Бо слуга твой паручыўся за хлопца перад бацькам сваім, кажучы: "Калі не прывяду яго да
цябе, буду грэшны перад бацькам сваім на ўсе дні".
33 І цяпер, прашу, няхай застанецца слуга твой замест хлопца нявольнікам пана майго, а
хлопец няхай пойдзе з братамі сваімі.
34 Бо як я прыйду да бацькі майго, а хлопца ня будзе са мною? Няхай ня ўбачу я ліха, якое
спаткае бацька мой».

Бц 45

1 І ня мог Язэп больш вытрываць пры ўсіх, што стаялі каля яго, і закрычаў: «Вывядзіце ўсіх
людзей ад мяне!» І не застаўся ніхто пры ім, калі Язэп адкрыўся братам сваім.
2 І голасна заплакаў [Язэп], і пачулі Эгіпцяне, і пачуў дом фараона.
3 І сказаў Язэп братам сваім: «Я — Язэп! Ці бацька мой яшчэ жывы?» І не маглі браты ягоныя
адказаць яму, бо яны трымцелі перад абліччам ягоным.
4 І сказаў Язэп братам сваім: «Наблізьцеся, калі ласка, да мяне». Яны наблізіліся. І ён сказаў:
«Я — Язэп, брат ваш, якога вы прадалі ў Эгіпет.
5 Але цяпер не сумуйце, і няхай ня будзе жалю ў вачах вашых, што вы прадалі мяне сюды, бо
дзеля захаваньня жыцьця паслаў мяне Бог перад вамі.
6 Бо вось, два гады голаду на зямлі, і яшчэ пяць гадоў, у якія нельга будзе ані араць, ані жаць.
7 І паслаў мяне Бог перад вамі, каб пакінуць з вас рэшту на зямлі і захаваць жыцьцё вашае
збаўленьнем вялікім.
8 І цяпер ня вы паслалі мяне сюды, але Бог, і Ён паставіў мяне як бацьку фараону і як пана ў-ва
ўсім доме ягоным, і я кірую ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
9 Пасьпяшайцеся, і ўзыйдзіце да бацькі майго, і скажыце яму: “Гэтак сказаў сын твой, Язэп:
"Бог паставіў мяне панам над усім Эгіптам. Прыйдзі да мяне, не марудзь.
10 І будзеш жыць у зямлі Гашэн; і будзеш блізка каля мяне ты, і сыны твае, і сыны сыноў тваіх,
і авечкі твае, і валы твае, і ўсё, што тваё.
11 І я буду карміць цябе там, бо яшчэ пяць гадоў голаду, каб не згалеў ты, і дом твой, і ўсё, што
тваё"”.
12 І вось, бачаць вочы вашыя, і вочы брата майго Бэн’яміна, што вусны мае прамаўляюць да
вас.
13 І распавядзіце бацьку майму пра ўсю славу маю ў Эгіпце і пра ўсё, што вы бачылі; і
пасьпяшайцеся, і прывядзіце бацьку майго сюды».
14 І ўпаў ён на шыю Бэн’яміну, брату свайму, і плакаў; і Бэн’ямін плакаў на шыі ягонай.
15 І цалаваў ён усіх братоў сваіх, і плакаў над імі. І потым размаўлялі з ім браты ягоныя.
16 І пачулі вестку ў доме фараона, якая казала: «Прыйшлі браты Язэпа». І добра гэта было ў
вачах фараона і ў вачах слугаў ягоных.
17 І сказаў фараон Язэпу: «Скажы братам сваім: “Зрабіце гэтак: абладуйце [збожжам] жывёлу
сваю, і ідзіце, і прыйдзіце ў зямлю Ханаан,
18 і вазьміце бацьку свайго, і сем’і свае, і прыйдзіце да мяне; і я дам вам добрую зямлю Эгіпту,
і вы будзеце есьці тлустасьць зямлі гэтай”.
19 А ты загадаеш: “Зрабіце гэтак: вазьміце сабе з зямлі Эгіпецкай вазы для дзяцей вашых і
жонак вашых, і вазьміце бацьку вашага, і прыходзьце.
20 І вочы вашыя няхай не шкадуюць прыладаў вашых, бо даброцьці ўсёй зямлі Эгіпецкай — для
вас”».
21 І зрабілі так сыны Ізраіля. І даў ім Язэп вазы паводле загаду фараона, і даў ім пасілкі ў
дарогу.
22 І ўсім, кожнаму з іх, ён даў зьмену адзеньня, а Бэн’яміну даў трыста срэбнікаў і пяць зьменаў
адзеньня.
23 А для бацькі свайго паслаў дзесяць аслоў, абладаваных даброцьцямі з Эгіпту, і дзесяць
асьліцаў, абладаваных збожжам і хлебам, і ежаю для бацькі свайго на дарогу.
24 І адаслаў ён братоў сваіх, і яны пайшлі. І сказаў ім: «Не сварыцеся ў дарозе».
25 І ўзыйшлі яны з Эгіпту, і прыйшлі ў зямлю Ханаан да Якуба, бацькі свайго.
26 І паведамілі яму, кажучы: «Яшчэ жывы Язэп, і ён кіруе ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай». І не
ўзварухнулася сэрца ягонае, бо ён не паверыў ім.
27 І прамовілі яму ўсе словы Язэпа, якія ён прамовіў ім, і ўбачыў ён вазы, якія прыслаў Язэп,
каб прывезьці яго, і ажыў дух Якуба, бацькі іхняга.
28 І сказаў Ізраіль: «Досыць! Яшчэ жыве Язэп, сын мой! Пайду і ўбачу яго, перш, чым памру».

Бц 46

1 І вырушыў Ізраіль у дарогу, і ўсё, што ў яго, і прыйшоў у Бээр-Шэву, і ахвяраваў ахвяры Богу
бацькі свайго Ісаака.
2 І сказаў Бог Ізраілю ў відзежы начным, і сказаў: «Якубе! Якубе!» А ён сказаў: «Вось я».
3 І сказаў: «Я — Бог, Бог бацькі твайго! Ня бойся зыйсьці ў Эгіпет, бо Я зраблю цябе там народам
вялікім.
4 Я зыйду з табою ў Эгіпет, і Я, выводзячы, таксама выведу цябе [адтуль]. І Язэп паложыць
руку сваю на вочы твае».
5 І падняўся Якуб з Бээр-Шэвы; і павезьлі сыны Ізраіля Якуба, бацьку свайго, і дзяцей сваіх, і
жонак сваіх на вазах, якія паслаў фараон, каб прывезьці яго.
6 І ўзялі яны статак свой і маёмасьць сваю, якую прыдбалі ў зямлі Ханаан, і прыйшлі ў Эгіпет
Якуб і ўсё насеньне ягонае з ім.
7 Сыноў сваіх і сыноў сыноў сваіх з сабою, і дочак сваіх і дочак сыноў сваіх, і ўсё насеньне сваё
прывёў ён з сабою ў Эгіпет.
8 І вось імёны сыноў Ізраіля, што прыйшлі ў Эгіпет: Якуб і сыны ягоныя. Першародны Якуба
Рубэн.
9 І сыны Рубэна: Ханох і Пальлю, і Хецрон, і Кармі.
10 І сыны Сымона: Емуэль і Ямін, і Агад, і Якін, і Цахар, і Шаўль, сын Хананейкі.
11 І сыны Левія: Гершон, Кегат і Мэрары.
12 А сыны Юды: Ер, і Анан, і Шэля, і Пэрэс, і Зарах. І памерлі Ер і Анан у зямлі Ханаан. І былі
сыны Пэрэса: Хецрон і Хамуль.
13 І сыны Ісахара: Тола і Пува, і Ёў, і Шымрон.
14 І сыны Завулёна: Сэрэд, і Элён, і Яхлеэль.
15 Гэта сыны Леі, якіх яна нарадзіла Якубу ў Падан-Араме, і [яшчэ] Дзіну, дачку ягоную. Усіх
душаў сыноў ягоных і дочак ягоных — трыццаць тры.
16 І сыны Гада: Цыф'ён і Хагі, Шуні і Эцбон, Еры і Ароды, і Ар'элі.
17 А сыны Асэра: Імна, і Ішва, і Ішві і Бэрыя, і Сэрах, сястра іхняя. А сыны Бэрыі: Хевер і
Малхіэль.
18 Гэта сыны Зільпы, якую даў Ляван Леі, дачцэ сваёй. Яна нарадзіла іх Якубу шаснаццаць
душаў.
19 Сыны Рахелі, жонкі Якуба: Язэп і Бэн'ямін.
20 І нарадзіліся ў Язэпа ў зямлі Эгіпецкай Манаса і Эфраім, якіх нарадзіла яму Аснат, дачка
Паты-Пэра, сьвятара з Ону.
21 А сыны Бэн'яміна: Бэла і Бэкер, і Ашбэль, Гера і Нааман, Эхі і Рош, Мупім і Хупім, і Ард.
22 Гэта сыны Рахелі, якіх яна нарадзіла Якубу, усіх душаў — чатырнаццаць.
23 А сыны Дана: Хушым.
24 Сыны Нэфталі: Яхцээль і Гуні, і Ецэр, і Шылем.
25 Гэта сыны Більгі, якую даў Ляван дачцэ сваёй Рахелі. Яна нарадзіла іх Якубу, усіх душаў —
сем.
26 Усяго душаў, што прыйшлі з Якубам у Эгіпет, якія выйшлі са сьцёгнаў ягоных, акрамя жонак
сыноў Якуба, усіх душаў — шэсьцьдзясят шэсьць.
27 А сыноў Язэпа, якія нарадзіліся яму ў Эгіпце, — дзьве душы. Усяго душаў з дому Якуба
прыйшло ў Эгіпет семдзясят.
28 І паслаў ён Юду перад сабою да Язэпа, каб той скіраваў аблічча яго на Гашэн. І прыйшлі ў
зямлю Гашэн.
29 І запрог Язэп калясьніцу сваю, і ўзыйшоў насустрач Ізраілю, бацьку свайму, у Гашэн, і
паказаўся яму, і ўпаў на шыю ягоную, і плакаў на шыі ягонай зноў.
30 І сказаў Ізраіль Язэпу: «Магу паміраць я гэтым разам, як убачыў аблічча тваё, бо ты яшчэ
жывы».
31 І сказаў Язэп братам сваім і дому бацькі свайго: «Я пайду і паведамлю фараону, і скажу яму:
"Браты мае і дом бацькі майго, якія былі ў зямлі Ханаан, прыйшлі да мяне.

32 Гэтыя людзі — пастухі авечак, бо яны гадавалі статак. І авечак сваіх, і валоў сваіх, і ўсё, што
ў іх, яны прывялі”.
33 І станецца, калі фараон пакліча вас і скажа: “Які занятак ваш?”,
34 вы скажаце: “Гадавалі статак слугі твае з маленства нашага і дагэтуль, і мы, і бацькі нашыя”,
каб вы пасяліліся ў зямлі Гашэн, бо брыдзяцца Эгіпцяне кожным пастухом авечак».

Бц 47

1 І прыйшоў Язэп, і паведаміў фараону, і сказаў: «Бацька мой, і браты мае, і авечкі іхнія, і валы
іхнія, і ўсё, што ў іх, прыйшлі з зямлі Ханаан, і вось, яны ў зямлі Гашэн».
2 І спаміж братоў сваіх ён узяў пяць чалавек, і паставіў іх перад фараонам.
3 І сказаў фараон братам ягоным: «Які ваш занятак?» І яны сказалі фараону: «Пастухі авечак
слугі твае, і мы, і бацькі нашыя».
4 І сказалі яны фараону: «Вандраваць у зямлі гэтай мы прыйшлі, бо няма пашы для авечак
слугаў тваіх, бо вялікі голад у зямлі Ханаан. І цяпер, просім, дазволь пасяліцца слугам тваім
у зямлі Гашэн».
5 І сказаў фараон Язэпу, кажучы: «Бацька твой і браты твае прыйшлі да цябе.
6 Зямля Эгіпецкая перад абліччам тваім. У найлепшым месцы зямлі пасялі бацьку свайго і
братоў сваіх. Няхай жывуць яны ў зямлі Гашэн. І калі ведаеш, што ёсьць паміж імі здольныя
людзі, пастаў іх даглядчыкамі над статкамі, якія ў мяне».
7 І прывёў Язэп Якуба, бацьку свайго, і паставіў яго перад абліччам фараона. І дабраславіў
Якуб фараона.
8 І сказаў фараон Якубу: «Колькі дзён [маюць] гады жыцьця твайго?»
9 І сказаў Якуб фараону: «Дзён гадоў вандраваньня майго — сто трыццаць гадоў. Кароткія і
ліхія былі дні гадоў жыцьця майго, і не дасягнулі яны да дзён гадоў жыцьця бацькоў маіх у
днях вандраваньня іхняга».
10 І дабраславіў Якуб фараона, і выйшаў ад аблічча фараона.
11 І пасяліў Язэп бацьку свайго і братоў сваіх, і даў ім уласнасьць у зямлі Эгіпецкай, у
найлепшай частцы зямлі той, у зямлі Рамсэс, як загадаў фараон.
12 І жывіў Язэп бацьку свайго і братоў сваіх, і ўвесь дом бацькі свайго хлебам адпаведна [ліку]
дзяцей.
13 А хлеба не было на ўсёй зямлі, бо голад быў вельмі цяжкі, і была вычарпаная зямля
Эгіпецкая і зямля Ханаанская з прычыны голаду.
14 І сабраў Язэп усё срэбра, якое знайшлося ў зямлі Эгіпецкай і ў зямлі Ханаанскай, за збожжа,
якое куплялі, і прынёс Язэп срэбра ў дом фараона.
15 І скончылася срэбра ў зямлі Эгіпецкай і ў зямлі Ханаанскай. І прыйшоў увесь Эгіпет да
Язэпа, кажучы: «Дай нам хлеба! Навошта мы маем памерці перад табою, бо скончылася
срэбра».
16 І сказаў Язэп: «Дайце статак ваш, і я буду даваць вам [хлеб] за статак ваш, калі скончылася
срэбра».
17 І яны прыводзілі статак свой да Язэпа, і даваў ім Язэп хлеб за коней, і за статкі авечак, і за
статкі валоў, і за аслоў; і жывіў іх хлебам за ўвесь статак іхні ў той год.
18 І скончыўся той год; і прыйшлі да яго ў наступным годзе, і сказалі яму: «Ня ўтоім ад пана
нашага, што скончылася срэбра, і статкі скаціны нашай — у пана нашага. Не засталося нічога
ў нас перад абліччам пана нашага, акрамя целаў нашых і грунтоў нашых.
19 Навошта маем памерці перад вачыма тваімі, і мы, і грунты нашыя? Купі нас і грунты нашыя
за хлеб; і будзем мы і грунты нашыя нявольнікамі фараона, а ты дай нам зерня, і мы будзем
жыць, і не памрэм, і грунты не спусьцеюць».
20 І набыў Язэп усе грунты ў Эгіпце для фараона, бо прадалі Эгіпцяне кожны поле сваё, бо
прыціснуў іх голад. І зямля стала фараонавай.
21 А народ ён перавёў у гарады ад [аднаго] канца мяжы Эгіпту аж да [другога] канца яго.

22 Толькі грунты сьвятароў не набыў, бо частка сьвятароў [была] ад фараона, і яны жывіліся
са сваёй часткі, якую даў ім фараон; таму яны і не прадалі грунты свае.
23 І сказаў Язэп народу: «Вось, я купіў сёньня вас і грунты вашыя для фараона. Вось вам зерне,
і засявайце зямлю.
24 І калі будзе жніво, давайце пятую частку фараону, а чатыры часткі застануцца вам засеяць
поле і на харчаваньне вам і тым, хто ў дамах вашых, і на харчаваньне дзецям вашым».
25 А яны сказалі: «Ты захаваў нам жыцьцё. Няхай мы знойдзем ласку ў вачах пана нашага, і
будзем слугамі фараону».
26 І паставіў гэта Язэп як пастанову, якая дагэтуль у зямлі Эгіпецкай, што для фараона пятая
частка [ўраджаю], толькі грунты сьвятароў [належаць] ім самім, ня сталі яны фараонавымі.
27 І жыў Ізраіль у зямлі Эгіпецкай, у зямлі Гашэн, і мелі ўласнасьць у ёй, і пладзіліся, і
памножыліся вельмі.
28 І жыў Якуб у зямлі Эгіпецкай сямнаццаць гадоў; і было дзён Якуба, гадоў жыцьця ягонага
— сто сорак сем гадоў.
29 І наблізіліся дні Ізраілю, каб памерці, і паклікаў ён сына свайго Язэпа, і сказаў яму:
«Калі я знайшоў ласку ў вачах тваіх, прашу, палажы руку сваю пад сьцягно маё і зрабі мне
міласэрнасьць і праўду, што не пахаваеш мяне ў Эгіпце.
30 Але буду я ляжаць з бацькамі сваімі. Вынясі мяне з Эгіпту і пахавай мяне ў магіле іхняй». І
той сказаў: «Зраблю паводле слова твайго».
31 І сказаў [Якуб]: «Прысягні мне». І прысягнуў яму. І схіліўся Ізраіль на верх ложка.

Бц 48

1 І сталася пасьля падзеяў гэтых, і сказалі Язэпу: «Вось, бацька твой хворы». І ён узяў двух
сыноў сваіх з сабою, Манасу і Эфраіма.
2 І паведамілі Якубу, і сказалі: «Вось, сын твой Язэп прыйшоў да цябе». І сабраў сілы Ізраіль, і
сеў на ложку.
3 І сказаў Якуб Язэпу: «Бог Усемагутны зьявіўся мне ў Люзе, у зямлі Ханаан, і дабраславіў
мяне,
4 і сказаў мне: “Вось, Я зраблю цябе плодным, і памножу цябе, і дам табе [быць] супольнасьцю
народаў, і дам зямлю гэтую насеньню твайму пасьля цябе на ўласнасьць вечную”.
5 І цяпер два сыны твае, што нарадзіліся табе ў зямлі Эгіпецкай, да прыходу майго да цябе ў
Эгіпет, яны — мае; Эфраім і Манаса, як Рубэн і Сымон, будуць мае.
6 А нашчадкі твае, якіх ты нарадзіў пасьля іх, будуць твае. Паводле імёнаў братоў сваіх будуць
яны называцца ў спадчыне сваёй.
7 А ў мяне, калі я прыйшоў з Падану, памерла ў мяне Рахель у зямлі Ханаан, у дарозе, калі яшчэ
заставаўся кавалак зямлі, каб дайсьці да Эфраты, і я пахаваў яе там, пры дарозе ў Эфрату, гэта
значыць у Бэтлеем».
8 І ўбачыў Ізраіль сыноў Язэпа, і сказаў: «Хто яны?»
9 І сказаў Язэп бацьку свайму: «Яны — сыны мае, якіх Бог даў мне тут». І сказаў [Якуб]:
«Вазьмі, прашу, іх да мяне, і я дабраслаўлю іх».
10 А вочы Ізраіля сталі цяжкія ад старасьці, ня мог ён бачыць. І наблізіў іх да яго, і ён пацалаваў
іх, і абняў іх.
11 І сказаў Ізраіль Язэпу: «Я не спадзяваўся ўбачыць аблічча тваё, і вось, Бог даў мне ўбачыць
насеньне тваё».
12 І адвёў іх Язэп ад каленяў ягоных, і пакланіўся яму абліччам сваім да зямлі.
13 І ўзяў Язэп іх абодвух, Эфраіма правіцай сваёю, леваруч Ізраіля, а Манасу — лявіцай сваёю,
праваруч Ізраіля, і наблізіўся да яго.
14 І выцягнуў Ізраіль правіцу сваю, і палажыў на галаву Эфраіма, а ён быў малодшы, а лявіцу
сваю — на галаву Манасы, і скрыжаваў рукі свае, бо Манаса быў першародны.
15 І дабраславіў Язэпа, і сказаў: «Бог, перад абліччам Якога хадзілі бацькі мае, Абрагам і Ісаак,
Бог, Які пасьвіў мяне ад [моманту], як я існую, аж да гэтага дня,

16 анёл, што выбаўляе мяне ад усякага ліха, няхай дабраславіць юнакоў гэтых; і няхай яны
будуць названыя імем маім і імем бацькоў маіх, Абрагама і Ісаака, і няхай разрастуцца яны ў
мноства сярод зямлі».
17 І ўбачыў Язэп, што бацька ягоны палажыў правую руку сваю на галаву Эфраіма, і было гэта
ліхім у вачах ягоных. І падхапіў ён руку бацькі свайго, каб пералажыць яе з галавы Эфраіма
на галаву Манасы.
18 І сказаў Язэп бацьку свайму: «Ня гэтак, ойча мой, бо гэта першародны. Палажы правіцу
тваю на галаву ягоную».
19 І запярэчыў бацька ягоны, і сказаў: «Ведаю, сыне мой, ведаю, таксама ён будзе народам, і
таксама ён будзе вялікі, але брат ягоны малодшы будзе большы за яго, і насеньне ягонае будзе
поўняю народаў».
20 І дабраславіў іх у той дзень, кажучы: «Табою будзе дабраслаўляць Ізраіль, кажучы: “Няхай
зробіць табе Бог, як Эфраіму і Манасе”». І паставіў Эфраіма перад Манасам.
21 І сказаў Ізраіль Язэпу: «Вось, я паміраю. І Бог будзе з вамі, і верне вас у зямлю бацькоў
вашых.
22 І я даў табе на адну частку больш за братоў тваіх, тую, якую я ўзяў з рукі Амарэя мячом маім
і лукам маім».

Бц 49

1 І паклікаў Якуб сыноў сваіх, і сказаў: «Зьбярыцеся, і я паведамлю вам, што спаткае вас у
пазьнейшыя дні.
2 Зыйдзіцеся і паслухайце, сыны Якуба, паслухайце Ізраіля, бацьку свайго.
3 Рубэн, першародны мой, ты — моц мая і пачатак сілы маёй, перавышаеш [усіх] годнасьцю і
перавышаеш магутнасьцю.
4 Ты пеніўся, як вада, і ня будзеш узвышаны, бо ты ўзыйшоў на ложак бацькі свайго; тады ты
зьняважыў пасьцель маю, узыйшоўшы [на яе].
5 Сымон і Левій, браты, зброя іхняя — прылада гвалту.
6 У нараду іхнюю ня ўвойдзе душа мая, і да супольнасьці іхняй не далучыцца слава мая, бо ў
гневе сваім яны забілі мужа і ў свавольстве сваім скалечылі вала.
7 Пракляты гнеў іхні, бо моцны, і лютасьць іхняя, бо заядлая. Падзялю іх у Якубе і расьцярушу
іх у Ізраілі.
8 Юда, цябе выслаўляць будуць браты твае. Рука твая — на карку ворагаў тваіх; паклоняцца
табе сыны бацькі твайго.
9 Юда — малады леў; ад здабычы, сыне мой, ты падымаешся. Прыхіліўся, лёг, як леў і як
ільвіца, хто падыме яго?
10 Ня будзе адняты скіпетр ад Юды і заканадаўца — ад ног ягоных, аж пакуль ня прыйдзе Той,
чыё яно, і Яму — паслухмянасць народаў.
11 Ён прывяжа да вінаграднай лазы асла свайго і да парастка выборнага вінаграду — асьлянятка
асьліцы сваёй. Ён абмые ў віне шаты свае і ў крыві вінаграду — адзеньне сваё.
12 Вочы [ягоныя] чырванейшыя за віно, а зубы — бялейшыя за малако.
13 Завулён на беразе мора будзе жыць і каля прыстані караблёў, і межы ягоныя — да Сідону.
14 Ісахар — асёл касьцісты, што ляжыць паміж загарадаў.
15 І ўбачыў ён супачынак, што добры, і зямлю, што прыемная, і нахіліў плечы свае насіць
цяжары і стаў слугою паднявольным.
16 Дан будзе судзіць народ свой, як адзін з родаў Ізраіля.
17 Будзе Дан зьмеем на дарозе, гадзюкай на сьцежцы, якая кусае пяты каня, і валіцца вершнік
ягоны назад.
18 На збаўленьне Тваё спадзяюся, ГОСПАДЗЕ!
19 Гад — войскі будуць перамагаць яго, але ён пераможа пяты [іхнія].
20 Пра Асэра — тлусты хлеб ягоны, і ён будзе даваць прысмакі валадарскія.
21 Нэфталі — ланя, выпушчаная [на свабоду], што дае прыгожыя словы.
22 Галіна плодная Язэп, галіна плодная над крыніцаю, галіны ягоныя пнуцца па муры.

23 І засмучалі яго, і стралялі ў яго, і ненавідзелі яго стральцы.
24 І застаўся моцным лук ягоны, і ўмацаваліся рамёны рук ягоных — ад рук Магутнага
Якубавага, адтуль Пастыр, Скала Ізраіля;
25 ад Бога бацькі твайго, і Ён дапаможа табе, і ад Усемагутнага, і Ён дабраславіць
цябе дабраславеньнямі неба згары і дабраславеньнямі бяздоньня, што ляжыць унізе,
дабраславеньнямі грудзей і ўлоньня.
26 Дабраславеньні бацькі твайго перавышаюць дабраславеньні бацькоў маіх, яны аж да
вяршыняў узгоркаў адвечных. Няхай будуць яны на галаве Язэпа і на цемені выбранага між
братамі сваімі.
27 Бэн'ямін — воўк драпежны, раніцаю будзе есьці здабычу і ўвечары будзе дзяліць прыбытак».
28 Усіх гэтых родаў Ізраіля — дванаццаць, і гэта тое, што прамаўляў ім бацька іхні; і дабраславіў
іх, і кожнага паводле дабраславеньня ягонага дабраславіў.
29 І загадаў ён ім, і сказаў ім: «Я буду далучаны да народу майго. Пахавайце мяне каля бацькоў
маіх, у пячоры, якая на полі Эфрона Хета,
30 у пячоры, што на полі Махпэля, якое насупраць Мамрэ ў зямлі Ханаан, якую купіў Абрагам
разам з полем Эфрона Хета на ўласнасьць для пахаваньня.
31 Там пахавалі Абрагама і Сару, жонку ягоную, там пахавалі Ісаака і Рэбэку, жонку ягоную; і
там я пахаваў Лею.
32 Набытыя гэтае поле і пячора, якая на ім, у сыноў Хета».
33 І скончыў Якуб загадваць сынам сваім, і палажыў ногі свае на ложак, і сканаў, і быў далучаны
да народу свайго.

Бц 50

1 І ўпаў Язэп на аблічча бацькі свайго, і плакаў над ім, і цалаваў яго.
2 І загадаў Язэп слугам сваім лекарам забальзамаваць бацьку ягонага; і забальзамавалі лекары
Ізраіля.
3 І прайшло сорак дзён, бо столькі вымагаецца дзён на бальзамаваньне. І плакалі па ім
Эгіпцяне семдзясят дзён.
4 І мінулі дні плачу па ім, і прамовіў Язэп дому фараона, кажучы: «Калі я знайшоў ласку ў
вачах вашых, скажыце, калі ласка, у вушы фараону, кажучы:
5 "Бацька мой узяў з мяне прысягу, кажучы: "Вось, я паміраю. У магіле маёй, якую я выкапаў
у зямлі Ханаан, там пахавай мяне". І цяпер я ўзыйду, і пахаваю бацьку свайго, і вярнуся"».
6 І сказаў фараон: «Узыйдзі і пахавай бацьку твайго, як ён узяў у цябе прысягу».
7 І ўзыйшоў Язэп хаваць бацьку свайго; і ўзыйшлі з ім усе слугі фараона, старшыні дому
ягонага, і ўсе старшыні зямлі Эгіпецкай,
8 і ўвесь дом Язэпа, і браты ягоныя, і дом бацькі ягонага. Толькі дзяцей сваіх, і авечак сваіх, і
валоў сваіх пакінулі ў зямлі Гашэн.
9 І ўзыйшлі з ім таксама калясьніцы і вершнікі, і быў табар вельмі вялікі.
10 І прыйшлі яны ў Гарэн-Гаатад на другім баку Ярдану, і галасілі там галашэньнем вялікім і
вельмі жалосным; і ўчыніў [Язэп] жалобу па бацьку сваім сем дзён.
11 І ўбачылі жыхары зямлі той, Хананейцы, жалобу ў Гарэн-Гаатадзе, і сказалі: «Гэта вялікая
жалоба ў Эгіпцянаў!» Дзеля гэтага назвалі імя яго: Абэль-Міцраім, які на другім баку Ярдану.
12 І зрабілі сыны [Якуба] з ім так, як ён загадаў ім.
13 І занесьлі яго сыны ягоныя ў зямлю Ханаан, і пахавалі яго ў пячоры на полі Махпэля, якую
купіў Абрагам разам з полем на ўласнасьць на пахаваньне ў Эфрона Хета, насупраць Мамрэ.
14 І вярнуўся Язэп пасьля пахаваньня ім бацькі свайго ў Эгіпет, ён і браты ягоныя, і ўсе, што
ўзыходзілі з ім хаваць бацьку ягонага.
15 І бачылі браты Язэпа, што памёр бацька іхні, і сказалі: «А што, калі зьненавідзіць нас Язэп і
адплочваючы, адплоціць нам за ўсё тое ліха, якое мы яму зрабілі?»
16 І загадалі яны сказаць Язэпу, кажучы: «Бацька твой загадаў перад сьмерцю сваёю, кажучы:

17 “Гэтак скажыце Язэпу: "Даруй, прашу, правіну братоў тваіх і грэх іхні, бо ліха зрабілі яны
табе". І цяпер даруй, прашу, слугам Бога бацькі твайго”». І плакаў Язэп дзеля [гэтых] словаў
да яго.
18 І прыйшлі таксама браты ягоныя, і ўпалі перад абліччам ягоным, і сказалі: «Вось, мы —
слугі для цябе».
19 І сказаў ім Язэп: «Ня бойцеся! Хіба я замест Бога?
20 І вы надумалі ліха супраць мяне, але Бог надумаў гэта на дабро, каб зрабіць так, як ёсьць
сёньня, каб захаваць жыцьцё народу вялікаму.
21 І цяпер ня бойцеся, я буду карміць вас і дзяцей вашых». І суцяшаў іх, і прамаўляў да сэрцаў
іхніх.
22 І пасяліўся Язэп у Эгіпце, ён і дом бацькі ягонага. І жыў Язэп сто дзесяць гадоў.
23 І бачыў Язэп у Эфраіма сыноў да трэцяга пакаленьня, таксама сыны Махіра, сына Манасы,
нарадзіліся на каленях Язэпа.
24 І сказаў Язэп братам сваім: «Я паміраю, але Бог, наведваючы, наведае вас і выведзе вас з
зямлі гэтай у зямлю, пра якую прысягаў Абрагаму, Ісааку і Якубу».
25 І ўзяў Язэп прысягу ў сыноў Ізраіля, кажучы: «Бог, наведваючы, наведае вас, і вы вынясіце
косткі мае адгэтуль».
26 І памёр Язэп, маючы сто дзесяць гадоў. І забальзамавалі яго, і палажылі ў дамавіну ў Эгіпце.

КНІГА ВЫХАД

1 І вось імёны сыноў Ізраіля, якія прыйшлі ў Эгіпет з Якубам, увайшлі кожны з домам сваім:
2 Рубэн, Сымон, Левій і Юда,
3 Ісахар, Завулён і Бэн'ямін,
4 Дан і Нэфталі, Гад і Асэр.
5 І ўсіх душаў, якія выйшлі з паясьніцы Якуба, было семдзясят, а Язэп быў у Эгіпце.
6 І памёр Язэп, і ўсе браты ягоныя, і ўсё пакаленьне тое.
7 І сыны Ізраіля пладзіліся, і нараджаліся, і памнажаліся, і ставаліся вельмі-вельмі магутнымі, і напоўнілася імі зямля.
8 І паўстаў новы валадар у Эгіпце, які ня ведаў Язэпа.
9 І сказаў ён народу свайму: «Вось, народ сыноў Ізраіля больш шматлікі і мацнейшы за нас.
10 Давайце мудра ўчынім адносна яго, каб ён не памнажаўся; бо як здарыцца вайна, ён злучыцца з ворагамі нашымі, і будзе ваяваць з намі, і выйдзе з зямлі гэтай».
11 І ён паставіў над ім наглядчыкаў працаў, каб уціскалі яго цяжкімі працамі. І пабудаваў [Ізраіль] на склады фараону гарады Пітом і Рамсэс.
12 І колькі ўціскалі яго, ён памнажаўся і пашыраўся. І [Эгіпцяне] трывожыліся з прычыны сыноў Ізраіля.
13 І зьняволілі Эгіпцяне сыноў Ізраіля, і ўціскалі,
14 і рабілі горкім жыцьцё іхняе цяжкаю працаю з глінаю і цэглаю, і ўсякаю працаю ў полі, і ўсякімі працамі зьневалялі іх і ўціскалі.
15 І сказаў валадар Эгіпту павітухам гебрайскім, якіх адной імя было Шыфра, а імя другой — Пуа,
16 і сказаў: «Калі будзеце пры радзінах у Гебраек, глядзіце на радзільны ложак: калі будзе сын, дык забіце яго, а калі дачка, няхай застанецца жывая».
17 Але павітухі баяліся Бога, і не рабілі так, як загадаў ім валадар Эгіпту, і пакідалі хлопцаў жывымі.
18 І паклікаў валадар Эгіпту павітухаў, і сказаў ім: «Чаму вы робіце гэта, чаму пакідаеце хлопцаў жывымі?»
19 І сказалі павітухі фараону: «Жанчыны гебрайскія не такія, як эгіпецкія; яны здаровыя, і яны нараджаюць перш, чым прыйдзе да іх павітуха».
20 І спагадаў Бог павітухам; і народ памнажаўся і вельмі мацнеў.
21 І сталася, [за тое], што павітухі баяліся Бога, Ён збудаваў ім дамы.
22 І загадаў фараон усяму народу свайму, кажучы: «Кожнага сына, які народзіцца [ў Гебраяў], кідайце ў раку; а кожную дачку пакідайце жывую».

Вых 2

1 І пайшоў чалавек з дому Левія, і ўзяў дачку [з дому] Левія.
2 І зачала тая жанчына, і нарадзіла сына, і бачыла яго, што ён прыгожы, і хавала яго тры месяцы.
3 І не магла даўжэй хаваць яго, і ўзяла кошык з трысьнёгу, і абмазала яго асфальтам і смалою; і палажыла ў яго хлопчыка, і паставіла ў чароце каля берагу ракі.
4 І стаяла сястра ягоная воддаль, каб ведаць, што станецца з ім.
5 І зыйшла дачка фараона мыцца да ракі, а служкі ейныя хадзілі каля ракі. І яна ўбачыла кошык сярод чароту, і паслала служку сваю ўзяць яго.
6 І адчыніла, і ўбачыла яго, гэтае дзіцятка; і вось, хлопчык плача; і пашкадавала яго, і сказала: «Ён з дзяцей Гебрайскіх».
7 І сказала сястра ягоная дачцэ фараона: «Ці не пайсьці мне і ці не паклікаць да цябе жанчыну карміцельку з Гебраек, каб яна выкарміла гэтае дзіцятка».
8 І сказала ёй дачка фараона: «Ідзі». І пайшла дзяўчынка, і паклікала маці дзіцяці.

9 І сказала ёй дачка фараона: «Вазьмі сабе дзіцятка гэтае і выкармі яго для мяне; і я дам табе
плату тваю». І ўзяла жанчына дзіцятка, і выкарміла яго.
10 І вырасла дзіця, і яна прывяла яго да дачкі фараона, і ён стаў у яе за сына, і назвала імя
ягонае — Майсей, і казала яна: «Бо з вады я выцягнула яго».
11 І сталася ў тыя дні, што вырас Майсей, і выйшаў да братоў сваіх, і ўбачыў цяжкія працы
іхнія; і ўбачыў, што Эгіпцянін б'е аднаго Гебрая з братоў ягоных.
12 І павярнуўся ён туды і сюды, і ўбачыў, што нікога няма, і забіў Эгіпцяніна, і схаваў яго ў
пяску.
13 І выйшаў ён на наступны дзень, і вось, два Гебраі вадзяцца. І сказаў ён таму, які крыўдзіў:
«Навошта ты б'еш бліжняга свайго?»
14 А той сказаў: «Хто паставіў цябе начальнікам і судзьдзём над намі? Ці ня хочаш ты забіць
мяне, як забіў Эгіпцяніна?» І спалохаўся Майсей, і сказаў: «Напэўна, сталася вядомым гэта».
15 І пачуў фараон пра гэтую справу, і шукаў забіць Майсея. І ўцёк Майсей ад фараона, і жыў у
зямлі Мадыян. І вось сеў ён каля студні.
16 У сьвятара Мадыянскага было сем дочак. І яны прыйшлі, і начэрпалі вады, і напоўнілі
карыты, каб напаіць авечак бацькі свайго.
17 І прыйшлі пастухі, і адагналі іх. І ўстаў Майсей, і дапамог ім, і напаіў авечак іхніх.
18 І прыйшлі яны да Рэўэля, бацькі свайго, і ён сказаў ім: «Чаму вы так хутка прыйшлі сёньня?»
19 Яны сказалі: «Эгіпцянін выратаваў нас ад пастухоў і нават начэрпаў нам вады, і напаіў
авечак».
20 Ён сказаў дочкам сваім: «Дзе ж ён? Чаму вы пакінулі чалавека гэтага? Паклічце яго, і няхай
ён зьесьць хлеб».
21 І ўпадабаў Майсей жыць у гэтага чалавека, і ён выдаў за Майсея дачку сваю Цыпору.
22 І яна нарадзіла сына, і [Майсей] назваў імя ягонае Гершом, бо ён казаў: «Я стаўся прыхаднем
у чужой зямлі».
23 І сталася праз шмат дзён, што памёр валадар Эгіпту. І стагналі сыны Ізраіля ад працаў
цяжкіх, і галасілі, і ўзыйшоў да Бога лямант іхні ад працаў цяжкіх.
24 І пачуў Бог стагнаньні іхнія, і ўзгадаў Бог запавет Свой з Абрагамам, Ісаакам і Якубам.
25 І глянуў Бог на сыноў Ізраіля, і даведаўся Бог [пра справы іхнія].

Вых 3

1 А Майсей пасьвіў авечак Етра, цесьця свайго, сьвятара Мадыянскага. І павёў ён чараду на
другі бок пустыні, і прыйшоў да гары Божае Харэў.
2 І зьявіўся яму анёл ГОСПАДА ў полымі агню з сярэдзіны цярновага куста. І ён бачыў, і вось,
цярновы куст гарэў агнём, але куст не згараў.
3 І сказаў Майсей: «Пайду і пагляджу на зьяву гэтую вялікую, чаму куст не згарае».
4 І ўбачыў ГОСПАД, што ён зьвярнуўся паглядзець [на гэта], і паклікаў яго Бог з сярэдзіны
куста, і сказаў: «Майсей, Майсей!» Ён сказаў: «Вось я!»
5 І сказаў [Бог]: «Не падыходзь сюды; здымі абутак твой з ног тваіх, бо месца, на якім ты стаіш,
ёсьць зямля сьвятая».
6 І сказаў: «Я — Бог бацькі твайго, Бог Абрагама, Бог Ісаака і Бог Якуба». І закрыў Майсей
аблічча сваё, бо баяўся глянуць на Бога.
7 І сказаў ГОСПАД: «Гледзячы, Я ўбачыў гора народу Майго, які ў Эгіпце, і Я пачуў стогн ягоны
з прычыны прыгнятальнікаў ягоных, бо Я ведаю пакуты ягоныя.
8 І Я зыходжу, каб вызваліць яго з рукі Эгіпцянаў і вывесьці яго з зямлі гэтай у зямлю добрую
і прасторную, у зямлю, якая цячэ малаком і мёдам, на месца Хананейцаў, і Хетаў, і Амарэяў,
і Пэрэзэяў, і Хівеяў, і Евусэяў.
9 І цяпер вось, стогн сыноў Ізраіля дайшоў да Мяне, і таксама Я бачу ўціск, якім Эгіпцяне
прыгнятаюць іх.
10 І цяпер ідзі, і Я пашлю цябе да фараона; і выведзі з Эгіпту народ Мой, сыноў Ізраіля».
11 І сказаў Майсей Богу: «Хто я, каб мне ісьці да фараона і каб мне вывесьці сыноў Ізраіля з
Эгіпту?»

12 І сказаў [Бог]: «Бо Я буду з табою. І вось табе знак, што Я паслаў цябе: калі ты выведзеш
народ з Эгіпту, будзеце служыць Богу на гэтай гары».
13 І сказаў Майсей Богу: «Вось, я прыйду да сыноў Ізраіля і скажу ім: “Бог бацькоў вашых
паслаў мяне да вас”. А яны скажуць мне: “Якое імя Яго?” Што я маю сказаць ім?»
14 І сказаў Бог Майсею: «Я Ёсьць, Хто Ёсьць». І сказаў: «Гэтак скажы сынам Ізраіля: “Той, Хто
Ёсьць, паслаў мяне да вас”».
15 І сказаў яшчэ Бог Майсею: «Гэтак скажы сынам Ізраіля: “ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, Бог
Абрагама, Бог Ісаака і Бог Якуба паслаў мяне да вас!” Гэта імя Маё на вякі, і гэта памятка пра
Мяне з пакаленьня ў пакаленьне.
16 Ідзі, зьбяры старшыняў Ізраіля і скажы ім: “ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, зьявіўся мне, Бог
Абрагама, Ісаака і Якуба, кажучы: "Наведваючы, наведаў Я вас і [бачыў], што робіцца вам у
Эгіпце.
17 І Я сказаў: ‘Я выведу вас з прыгнёту Эгіпецкага ў зямлю Хананейцаў, Хетаў, Амарэяў,
Пэрэзэяў, Хівеяў і Евусэяў, у зямлю, якая цячэ малаком і мёдам’””.
18 І яны паслухаюць голасу твайго, і прыйдзеш ты і старшыні Ізраіля да валадара Эгіпту, і вы
скажаце яму: “ГОСПАД, Бог Гебраяў, зьявіўся нам, і цяпер дай нам ісьці ў дарогу на тры дні ў
пустыню, каб мы склалі ахвяру ГОСПАДУ, Богу нашаму”.
19 І Я ведаю, што ня дасьць вам валадар Эгіпту ісьці, хіба [будзе змушаны] рукой магутнай.
20 І Я выцягну руку Маю, і ўдару Эгіпет усімі цудамі Маімі, якія ўчыню пасярод яго, і пасьля
гэтага ён пусьціць вас.
21 І Я дам ласку народу гэтаму ў вачах Эгіпцянаў; і будзе, што калі вы пойдзеце, ня пойдзеце з
пустымі рукамі.
22 І папросіць жанчына ў суседкі сваёй і ў гаспадыні дому свайго посуд срэбны і посуд залаты,
і адзеньне, і вы апранеце ў яго сыноў сваіх і дочак сваіх, і спустошыце Эгіпет».

Вых 4

1 І адказаў Майсей, і сказаў: «А калі яны не паверацъ мне і не паслухаюць голасу майго, бо
скажуць: “Не зьявіўся табе ГОСПАД”?».
2 І сказаў яму ГОСПАД: «Што гэта ў руцэ тваёй?» Ён адказаў: «Кій».
3 І сказаў: «Кінь яго на зямлю». І ён кінуў яго на зямлю, і стаўся ён зьмеем, і ўцякаў Майсей
ад яго.
4 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Выцягні руку тваю і схапі яго за хвост!» І выцягнуў ён руку сваю,
і схапіў яго, і ён стаўся кіем у далоні ягонай.
5 «Гэта каб паверылі, што зьявіўся табе ГОСПАД, Бог бацькоў іхніх, Бог Абрагама, Бог Ісаака і
Бог Якуба».
6 І сказаў ГОСПАД яму яшчэ: «Улажы руку тваю ў заўлоньне тваё». І ён улажыў руку сваю ў
заўлоньне сваё, і выняў, і вось, рука ягоная пракажоная, як сьнег.
7 І сказаў: «Улажы зноў руку тваю ў заўлоньне тваё». І ён улажыў зноў руку сваю ў заўлоньне
сваё. І выняў яе з заўлоньня свайго, і вось, яна ізноў як цела ягонае.
8 «І станецца, што калі яны не паверацъ табе і не паслухаюць голасу першага знаку, дык
паверацъ голасу знаку апошняга.
9 І станецца, што калі не паверацъ таксама двум гэтым знакам і не паслухаюць голасу твайго,
возьмеш з ракі ваду і выльеш на сухую зямлю, і станецца, што вада, якую ты возьмеш з ракі,
станецца крывёй на сухой зямлі».
10 І сказаў Майсей ГОСПАДУ: «О Госпадзе мой, я — чалавек невымоўны і ўчора, і пазаўчора, і
цяпер, калі Ты гаворыш да слугі Свайго, бо я [маю] цяжкія вусны і цяжкі язык».
11 І сказаў ГОСПАД яму: «Хто даў вусны чалавеку? Хто робіць немым або глухім, або
відушчым, або сьляпым? Ці ня Я, ГОСПАД?
12 І цяпер ідзі; і Я буду з вуснамі тваімі, і навучу цябе, што маеш гаварыць».
13 І сказаў [Майсей]: «О Госпадзе мой! Пашлі, прашу, [другога], каго маеш паслаць».

14 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА на Майсея, і Ён сказаў: «Ці ж няма Аарона, брата твайго, Лявіта?
Я ведаю, што ён, гаворачы, [добра] гаворыць, і вось, ён выйдзе насустрач табе, і ўбачыць цябе,
і ўзрадуецца ў сэрцы сваім.
15 І ты будзеш гаварыць да яго і ўкладаць словы ў вусны ягоныя; і Я буду з вуснамі тваімі і з
вуснамі ягонымі, і буду вучыць вас, што вам рабіць.
16 І будзе ён гаварыць замест цябе да народу. І ён будзе вуснамі тваімі, а ты будзеш яму як
Бог.
17 І возьмеш у руку тваю кій гэты, якім зробіш знакі».
18 І пайшоў Майсей, і вярнуўся да Етра, цесьця свайго, і сказаў яму: «Пайду і вярнуся да братоў
маіх, якія ў Эгіпце, і пагляджу, ці яны яшчэ жывыя?» І сказаў Етра Майсею: «Ідзі ў супакоі».
19 І сказаў ГОСПАД Майсею ў Мадыяне: «Ідзі, вярніся ў Эгіпет, бо памерлі ўсе людзі, якія шукалі
душы тваёй».
20 І ўзяў Майсей жонку сваю і сыноў сваіх, і пасадзіў іх на асла, і вярнуўся ў зямлю Эгіпецкую.
І ўзяў кій Божы ў руку сваю.
21 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Калі пойдзеш, каб вярнуцца ў Эгіпет, глядзі, каб усе цуды, якія Я
ўлажыў у руку тваю, ты зрабіў іх перад фараонам. А Я зраблю цьвёрдым сэрца ягонае, і ён не
адпусьціць народ.
22 І скажы фараону: “Гэтак кажа ГОСПАД. Сын Мой, першародны Мой — Ізраіль.
23 Я кажу табе: "Адпусьці сына Майго, каб ён служыў Мне. А калі адмовішся адпусьціць яго,
вось, Я заб’ю сына твайго, першароднага твайго"”».
24 І сталася ў дарозе, у [месцы] начаваньня пераняў яго ГОСПАД і шукаў забіць яго.
25 І ўзяла Цыпора крэмень, і абрэзала скуравінку сына свайго, і дакранулася да ног ягоных, і
сказала: «Бо ты мне жаніх крыві».
26 І адступіў [Госпад] ад яго. Тады яна сказала: «Ты — жаніх крыві праз абразаньне».
27 І сказаў ГОСПАД Аарону: «Ідзі насустрач Майсею ў пустыню». І ён пайшоў, і пераняў яго на
гары Божай, і пацалаваў яго.
28 І пераказаў Майсей Аарону ўсе словы ГОСПАДА, Які паслаў яго, і ўсе знакі, якія Ён загадаў
яму [зрабіць].
29 І пайшлі Майсей і Аарон, і сабралі яны ўсіх старшыняў сыноў Ізраіля.
30 І пераказаў Аарон усе словы, якія казаў ГОСПАД Майсею, і зрабіў знакі перад вачыма народу.
31 І паверыў народ, і яны пачулі, што ГОСПАД наведаў сыноў Ізраіля і ўбачыў прыгнёт іхні, і
схіліліся, і пакланіліся.

Вых 5

1 І потым прыйшлі Майсей і Аарон, і сказалі фараону: «Гэтак кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля:
“Адпусьці народ Мой, і яны будуць сьвяткаваць [сьвята] Мне ў пустыні”».
2 І сказаў фараон: «Хто такі ГОСПАД, каб я паслухаў голасу Ягонага адпусьціць Ізраіля? Я ня
ведаю ГОСПАДА і таксама Ізраіля не адпушчу».
3 І яны сказалі: «Бог Гебраяў зьявіўся нам. Дык мы пойдзем на тры дні дарогі ў пустыню, і
складзем ахвяру ГОСПАДУ, Богу нашаму, каб Ён не наведаў нас пошасьцю або мячом».
4 І сказаў ім валадар Эгіпту: «Навошта вы, Майсей і Аарон, адцягваеце народ ад працы ягонай?
Ідзіце да работаў вашых».
5 І сказаў фараон: «Вось, шматлікі цяпер народ зямлі гэтай, а вы адцягваеце іх ад работаў
іхніх».
6 І загадаў фараон у той дзень прыганятым народу і наглядчыкам яго, кажучы:
7 «Не давайце больш народу саломы на выраб цэглы, як учора і пазаўчора. Няхай яны ідуць і
зьбіраюць сабе салому.
8 А колькасьць цэглы, якую яны выраблялі ўчора і пазаўчора, налажыце на іх і не зьмяншайце
яе; бо яны лянуюцца і таму крычаць, кажучы: “Пойдзем, складзем ахвяру Богу нашаму”.
9 Няхай абцяжарыць праца людзей, і няхай яны працуюць і ня слухаюць словаў хлусьлівых».
10 І выйшлі прыганятыя народу і наглядчыкі яго, і сказалі народу, кажучы: «Гэтак кажа
фараон: “Не даю вам саломы.

11 Самі ідзіце, бярыце сабе салому, дзе знойдзеце, бо нічога ня зьменшыцца ў працы вашай”».
12 І расьсеяўся народ па ўсёй зямлі Эгіпецкай зьбіраць іржышча замест саломы.
13 А прыганятыя прынукалі, кажучы: «Выконвайце працу вашую, норму дзённую ў той самы
дзень, як тады, калі была салома».
14 І білі наглядчыкаў сыноў Ізраіля, якіх паставілі над імі прыганятыя фараона, кажучы: «Чаму
ня выканалі норму вырабу цэглы, што была ўчора і пазаўчора, ані ўчора, ані сёньня?»
15 І прыйшлі наглядчыкі сыноў Ізраіля, і крычалі да фараона, кажучы: «Чаму ты так робіш
адносна слугаў тваіх?
16 Саломы не даюць слугам тваім, а цэглу, кажуць нам, рабіце. І вось, слугаў тваіх б’юць; і
вінавацяць народ твой».
17 Але ён сказаў: «Лайдакі вы, лайдакі; і таму вы кажаце: “Хадземце, складзем ахвяру
ГОСПАДУ”.
18 І цяпер ідзіце, працуйце, і саломы не дадуць вам, але вызначаную колькасьць цэглы
давайце».
19 І ўбачылі наглядчыкі сыноў Ізраіля, што яны ў бядзе, бо сказана: «Не зьмяншайце
колькасьць цэглы, норму дзённую ў той самы дзень».
20 І сустрэлі яны Майсея і Аарона, якія стаялі, чакаючы іх, калі яны выйшлі ад фараона,
21 і сказалі ім: «Няхай узгляне ГОСПАД на вас і асудзіць, бо вы зрабілі нас агіднымі ў вачах
фараона і ў вачах слугаў ягоных, і далі меч у рукі іхнія, каб забіць нас».
22 І зьвярнуўся Майсей да ГОСПАДА, і сказаў: «Госпадзе, чаму Ты робіш зло народу гэтаму?
Навошта Ты паслаў мяне?
23 Бо ад таго часу, як я прыйшоў да фараона, каб гаварыць у імя Тваё, зло робіцца народу
гэтаму; а вызваліць, Ты ня вызваліў народ Твой!»

Вых 6

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Цяпер ты ўбачыш, што Я зраблю фараону, бо дзеля моцнае рукі ён
выпусьціць іх і дзеля моцнае рукі ён выганіць іх з зямлі сваёй».
2 І прамовіў Бог да Майсея, і сказаў яму: «Я — ГОСПАД.
3 І Я зьяўляўся Абрагаму, Ісааку і Якубу як Бог Усемагутны, але імя Маё, ГОСПАД, Я ня даў
ведаць ім.
4 І Я заключыў запавет Мой з імі, каб даць ім зямлю Ханаан, зямлю вандраваньня іхняга, у
якой яны вандравалі.
5 І таксама Я пачуў стогны сыноў Ізраіля, якіх Эгіпцяне зрабілі нявольнікамі, і ўзгадаў запавет
Мой.
6 Дзеля гэтага скажы сынам Ізраіля: “Я — ГОСПАД, і Я выведу вас з-пад ярма Эгіпецкага, і
выратую вас з няволі іхняе, і вызвалю вас рамяном узьнятым і судамі вялікімі.
7 І Я вазьму вас Сабе за народ, і буду вам Богам, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД, Бог ваш,
Які вывеў вас з-пад ярма Эгіпецкага.
8 І Я прывяду вас у тую зямлю, пра якую Я падняў руку Сваю, каб даць яе Абрагаму, Ісааку і
Якубу, і дам яе вам на ўласнасьць. Я — ГОСПАД”».
9 І гаварыў Майсей гэтак да сыноў Ізраіля, але яны ня слухалі Майсея з прычыны
маладушнасьці і цяжкай працы.
10 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
11 «Ідзі, скажы фараону, валадару Эгіпту, каб адпусьціў сыноў Ізраіля з зямлі сваёй».
12 І прамовіў Майсей перад абліччам ГОСПАДА, кажучы: «Вось, сыны Ізраіля ня слухаюць
мяне; і як жа паслухае мяне фараон? А я [маю] неабрэзаныя вусны».
13 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, і загадаў ім [казаць] да сыноў Ізраіля і да фараона,
валадара Эгіпту, каб вывесьці сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай.
14 Гэта галовы дамоў бацькоў іхніх. Сыны Рубэна, першароднага Ізраіля: Ганох і Пальлю,
Хецрон і Кармі. Гэта плямёны Рубэна.
15 А сыны Сымона: Емуэль і Ямін, і Агад, і Яхін, і Цахар, і Шаўль, сын Ханаанянкі. Гэта плямёны
Сымона.

16 І вось імёны сыноў Левія паводле радаводаў іхніх: Гершон, і Кегат, і Мэрары. А гадоў жыцьця
Левія было сто трыццаць сем гадоў.
17 Сыны Гершона: Ліўні і Шымэй паводле плямёнаў іхніх.
18 А сыны Кегата: Амрам, і Іцгар, і Хеўрон, і Узіэль. А гадоў жыцьця Кегата было сто трыццаць
тры гады.
19 А сыны Мэрары: Махлі і Мушы. Гэта плямёны Левія паводле радаводаў іхніх.
20 І ўзяў Амрам Ёхабэд, цётку сваю, сабе за жонку, і яна нарадзіла яму Аарона і Майсея. А гадоў
жыцьця Амрама было сто трыццаць сем гадоў.
21 А сыны Іцгара: Карах, і Нэфэг, і Зіхры.
22 А сыны Узыэля: Мішаэль, і Эльцафан, і Сытры.
23 І ўзяў Аарон Элішэбу, дачку Амінадава, сястру Нахшона, сабе за жонку, і яна нарадзіла яму
Надава і Абігу, Элеазара і Ітамара.
24 І сыны Караха: Асір, і Элькана, і Абіясаф. Гэта плямёны Караха.
25 І Элеазар, сын Аарона, узяў [адну] з дачок Путыэля сабе за жонку, і яна нарадзіла яму
Пінхаса. Вось галовы бацькоў Лявітаў паводле плямёнаў іхніх.
26 Гэта вось Аарон і Майсей, якім сказаў ГОСПАД: «Выведзіце сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай
паводле дружынаў іхніх».
27 Яны прамаўлялі да фараона, валадара Эгіпту, каб вывесьці сыноў Ізраіля з Эгіпту, гэтыя
Майсей і Аарон.
28 І сталася ў дзень, калі ГОСПАД прамаўляў да Майсея ў зямлі Эгіпецкай.
29 І сказаў ГОСПАД Майсею, кажучы: «Я — ГОСПАД. Кажы фараону, валадару Эгіпту, усё, што
Я кажу табе».
30 І Майсей сказаў перад абліччам ГОСПАДА: «Вось, я [маю] неабрэзаныя вусны, і як жа
паслухае мяне фараон?»

Вых 7

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Глядзі, Я паставіў цябе як Бога для фараона, а Аарон, брат твой,
будзе прарокам тваім.
2 Ты будзеш гаварыць усё, што Я загадаю табе, а Аарон, брат твой, будзе гаварыць да фараона,
і ён адпусьціць сыноў Ізраіля з зямлі сваёй.
3 І Я зраблю цьвёрдым сэрца фараона, і памножу знакі Мае і цуды Мае ў зямлі Эгіпецкай.
4 І не паслухае вас фараон, і Я пакладу руку Маю на Эгіпет, і выведу войска Маё, народ Мой,
сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай праз суды вялікія.
5 І даведаюцца Эгіпцяне, што Я — ГОСПАД, калі выцягну руку Маю на Эгіпет і выведу сыноў
Ізраіля спаміж іх».
6 І зрабілі [так] Майсей і Аарон; як загадаў ім ГОСПАД, так яны і ўчынілі.
7 І Майсею было восемдзясят гадоў, а Аарону — восемдзясят тры гады, калі прамаўлялі яны да
фараона.
8 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону, кажучы:
9 «Калі скажа вам фараон, кажучы: “Дайце ваш цуд”, ты скажы Аарону: “Вазьмі кій твой і кінь
перад фараонам”; і ён станецца цмокам».
10 І прыйшоў Майсей і Аарон да фараона, і ўчынілі так, як загадаў ГОСПАД. І кінуў Аарон кій
свой перад фараонам і перад слугамі ягонымі, і ён стаўся цмокам.
11 І паклікаў фараон мудрацоў і чараўнікоў, і ўчынілі варажбіты Эгіпецкія варажбою сваёю тое
самае.
12 І кінуў кожны кій свой, і яны сталіся цмокамі, але праглынуў кій Ааронаў кіі іхнія.
13 Але зацьвярдзела сэрца фараона, і ён не паслухаў іх, як гаварыў ГОСПАД.
14 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Закамянела сэрца фараона; ён адмаўляецца адпусьціць народ.
15 Ідзі да фараона раніцаю. Вось, ён выйдзе да вады, а ты стань насупраць яго на беразе ракі; і
кій, які перамяняўся ў зьмея, возьмеш у руку тваю.

16 І скажы яму: “ГОСПАД, Бог Гебраяў, паслаў мяне да цябе, кажучы: "Адпусьці народ Мой, і
ён будзе служыць Мне ў пустыні". І вось, ты не паслухаў аж да цяпер.
17 Гэтак кажа ГОСПАД: "З гэтага ты даведаешся, што Я — ГОСПАД". Вось, я ўдару кіем, які ў
руцэ маёй, па вадзе, якая ў рацэ, і яна пераменіцца ў кроў,
18 і рыба, якая ў рацэ, здохне, і рака засьмярдзіць, і агідна будзе Эгіпцянам піць ваду з ракі”».
19 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Скажы Аарону: “Вазьмі кій твой і выцягні руку тваю на воды
Эгіпту, на рэкі іхнія, на ручаі іхнія, на сажалкі іхнія і на ўсялякія ставы водаў іхніх; і стануцца
яны крывёй, і будзе кроў па ўсёй зямлі Эгіпецкай, і ў [начыньнях] драўляных і каменных”».
20 І зрабілі Майсей і Аарон так, як загадаў ГОСПАД. І падняў ён кій, і ўдарыў па вадзе, якая
ў рацэ, перад вачыма фараона і перад вачыма слугаў ягоных, і перамянілася ўся вада, якая ў
рацэ, у кроў.
21 І рыба, якая ў рацэ, падохла, і засьмярдзела рака, і не маглі Эгіпцяне піць вады з ракі; і была
кроў у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
22 І зрабілі гэтаксама варажбіты Эгіпецкія варажбою сваёю. І зацьвярдзела сэрца фараона, і ён
не паслухаў іх, як і казаў ГОСПАД.
23 І павярнуўся фараон, і пайшоў у дом свой; і не зьвярнуў сэрца свайго да гэтага.
24 І капаў увесь Эгіпет вакол ракі ваду, каб піць, бо не маглі піць вады з ракі.
25 І споўнілася сем дзён пасьля таго, як ГОСПАД ударыў раку.

Вых 8

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Прыйдзі да фараона і скажы яму: “Адпусьці народ Мой, і ён будзе
служыць Мне.
2 Калі ж ты адмаўляешся адпусьціць, вось, Я ўдару ўсе межы твае жабамі.
3 І будзе раіцца рака жабамі, і яны выйдуць, і ўвойдуць у дом твой, і ў спальню тваю, і на ложак
твой, і ў дом слугі твайго, і ў народ твой, і ў печы твае, і ў дзежы твае.
4 І на цябе, і на народ твой, і на ўсіх слугаў тваіх узыйдуць жабы”».
5 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Скажы Аарону: “Выцягні руку тваю з кіем тваім на ручаі, і на рэкі,
і на азёры, і ўзьвядзі жабаў на зямлю Эгіпецкую”».
6 І выцягнуў Аарон руку сваю на воды Эгіпецкія, і выйшлі жабы, і пакрылі зямлю Эгіпецкую.
7 І зрабілі так варажбіты варажбою сваёю, і ўзьвялі жабаў на зямлю Эгіпецкую.
8 І паклікаў фараон Майсея і Аарона, і сказаў: «Прасіце ГОСПАДА, каб Ён аддаліў жабаў ад мяне
і ад народу майго, і я адпушчу народ, і яны складуць ахвяры ГОСПАДУ».
9 І сказаў Майсей фараону: «Прызнач мне, калі прасіць за цябе, і за слугаў тваіх, і за народ
твой, каб жабы былі зьнішчаны ў цябе, у дамах тваіх, і засталіся толькі ў рацэ».
10 Ён сказаў: «Заўтра». І сказаў [Майсей]: «Паводле слова твайго, каб ты даведаўся, што няма
[нікога] як ГОСПАД, Бог наш.
11 І адыйдуць жабы ад цябе, ад дамоў тваіх, і ад слугаў тваіх, і ад народу твайго, толькі ў рацэ
застануцца».
12 І выйшлі Майсей і Аарон ад фараона, і Майсей клікаў да ГОСПАДА адносна жабаў, якіх узьвёў
на фараона.
13 І зрабіў ГОСПАД паводле слова Майсея, і здохлі жабы ў дамах, і ў дварах, і на палях.
14 І пазьбіралі іх купы купаў, і засьмярдзелася зямля.
15 І ўбачыў фараон, што сталася палёгка, і закамяніў сэрца сваё, і не паслухаў іх, як і гаварыў
ГОСПАД.
16 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Скажы Аарону: “Выцягні кій твой і ўдар у пыл зямлі, і станецца
пыл камарамі ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай”».
17 І яны зрабілі так, і выцягнуў Аарон руку сваю з кіем сваім, і ўдарыў у пыл зямлі, і зьявіліся
камары на людзях і на скаціне. Увесь пыл зямлі стаўся камарамі ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
18 І рабілі так варажбіты варажбою сваёй, каб зьявіліся камары, але не змаглі. І былі камары
на людзях і на скаціне.
19 І сказалі варажбіты фараону: «Палец Божы гэта». Але сэрца фараона зацьвярдзела, і ён не
паслухаў іх, як і гаварыў ГОСПАД.

20 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Устань раніцаю і стань перад фараонам. Вось, ён ідзе да вады, і
ты скажы яму: “Гэтак кажа ГОСПАД: "Адпусьці народ Мой, і ён будзе служыць Мне.
21 Бо калі не адпусьціш народ Мой, вось, Я пашлю на цябе, і на слугаў тваіх, і на народ твой, і
на дамы твае мухаў, і напоўняцца дамы Эгіпцянаў мухамі, і таксама грунты, на якіх яны.
22 І Я аддзялю ў той дзень зямлю Гашэн, у якой жыве народ Мой, каб ня было там мухаў, каб
ты даведаўся, што Я — ГОСПАД пасярод зямлі.
23 І Я зраблю розьніцу паміж народам Маім і народам тваім. Заўтра станецца знак гэты"”».
24 І зрабіў ГОСПАД гэтак, і наляцелі ўцяжлівыя мухі на дом фараона, і на дом слугаў ягоных, і
на ўсю зямлю Эгіпецкую; гінула зямля ад мухаў.
25 І паклікаў фараон Майсея і Аарона, і сказаў ім: «Ідзіце, складзіце ахвяру Богу свайму ў гэтай
зямлі».
26 І сказаў Майсей: «Не належыцца рабіць гэтак, бо агіду для Эгіпцянаў мы складзем у ахвяру
ГОСПАДУ, Богу нашаму; вось, мы будзем складаць у ахвяру тое, што агіднае ў Эгіпцянаў, перад
вачыма іхнімі, і ці не ўкамянуюць яны нас?
27 На тры дні дарогі мы пойдзем у пустыню і складзем ахвяру ГОСПАДУ, Богу нашаму, як Ён
скажа нам».
28 І сказаў фараон: «Я адпушчу вас, і вы складзеце ахвяру Богу свайму ў пустыні; толькі
аддаляючыся, не аддаляйцеся, каб зыйсьці. Прасіце за мяне».
29 І сказаў Майсей: «Вось, я выйду ад цябе, і буду прасіць ГОСПАДА, і адыйдуць мухі ад
фараона, і ад слугаў ягоных, і ад народу ягонага заўтра. Толькі няхай фараон больш не
падманвае, не адпускаючы народ скласьці ахвяру ГОСПАДУ».
30 І выйшаў Майсей ад фараона, і прасіў ГОСПАДА.
31 І зрабіў ГОСПАД паводле слова Майсея, і адвёў мухаў ад фараона, ад слугаў ягоных і ад
народу ягонага; не засталося аніводнай.
32 Але фараон закамяніў сэрца сваё таксама гэтым разам і не адпусьціў народ.

Вых 9

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Увайдзі да фараона і прамоў яму: “Гэтак кажа ГОСПАД, Бог
Гебраяў: “Адпусьці народ Мой, і ён будзе служыць Мне”.
2 Бо калі ты адмовішся выпусьціць і будзеш яшчэ трымаць іх,
3 вось, рука ГОСПАДА будзе на статку тваім, які ў полі, на конях, на аслах, на вярблюдах, на
валах і авечках, зараза вельмі цяжкая.
4 І аддзеліць ГОСПАД статак Ізраіля ад статку Эгіпецкага, і нічога ня здохне з усяго таго, што ў
сыноў Ізраіля”».
5 І прызначыў ГОСПАД час, кажучы: «Заўтра зробіць ГОСПАД гэтае слова ў зямлі».
6 І зрабіў ГОСПАД гэтае слова назаўтра, і паздыхаў увесь статак Эгіпецкі; а ў статку сыноў
Ізраіля ня здохла аніводнага.
7 І паслаў фараон, і вось, ня здохла ў статку Ізраіля аніводнага. І закамянела сэрца фараона, і
ён не адпусьціў народ.
8 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону: «Вазьміце сабе поўныя жмені сажы з печы, і няхай сыпне
яе Майсей у неба перад вачыма фараона.
9 І станецца яна пылам па ўсёй зямлі Эгіпецкай, і будзе яна на людзях і на скаціне як
запаленьне са скуламі па ўсёй зямлі Эгіпецкай».
10 І ўзялі яны сажу з печы, і сталі перад фараонам. І сыпнуў яе Майсей у неба, і сталася
запаленьне са скуламі на людзях і на скаціне.
11 І не маглі варажбіты ўстаяць перад Майсеем з прычыны запаленьня, бо запаленьне было на
варажбітах і на ўсіх Эгіпцянах.
12 І зацьвярдзіў ГОСПАД сэрца фараона, і ён не паслухаў іх, як казаў ГОСПАД Майсею.
13 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Устань раніцаю, і стань перад фараонам, і скажы яму: “Гэтак
кажа ГОСПАД, Бог Гебраяў: "Адпусьці народ Мой, і ён будзе служыць Мне.
14 Бо гэтым разам Я пашлю ўсе плягі Мае ў сэрца тваё, і на слугаў тваіх, і на народ твой, каб ты
даведаўся, што няма падобнага да Мяне на ўсёй зямлі.

15 Бо цяпер, калі Я выцягнуў руку Маю, і ўдару цябе і народ твой заразаю, ты будзеш выгублены
з зямлі.
16 Але дзеля таго Я захаваў цябе, каб паказаць табе сілу Маю і каб абвяшчалі імя Маё па ўсёй
зямлі.
17 Ты яшчэ ўзьвялічваешся над народам Маім, каб не адпусьціць іх.
18 Вось, Я спашлю заўтра ў гэты самы час град вельмі вялікі, да якога падобнага не было ў
Эгіпце ад дня яго заснаваньня аж дагэтуль.
19 І цяпер пашлі, каб схаваць статак твой і ўсё, што ёсьць у цябе ў полі. Кожны чалавек і
скаціна, якія будуць засьпетыя ў полі і ня будуць забраныя ў дамы, — зыйдзе на іх град, і яны
памруць"”».
20 Тыя са слугаў фараонавых, якія спужаліся слова ГОСПАДА, сабралі слугаў сваіх і статкі свае
ў дамы.
21 А хто не зьвярнуў сэрца свайго да слова ГОСПАДА, той пакінуў слугаў сваіх і статкі свае ў
полі.
22 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Выцягні руку тваю да неба, і будзе град у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай,
на чалавека, на скаціну і на ўсю траву палявую ў зямлі Эгіпецкай».
23 І выцягнуў Майсей кій свой да неба; і ГОСПАД даў грымоты і град, і зыйшоў агонь на зямлю,
і спаслаў ГОСПАД град на ўсю зямлю Эгіпецкую.
24 І быў град і агонь, зьмяшаны з градам, вельмі вялікі, якога не было ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай
з часу, як [Эгіпет] стаў народам.
25 І пабіў град у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай усё, што было ў полі, ад чалавека да скаціны, і ўсю
траву палявую пабіў град, і ўсе дрэвы ў полі паламіў.
26 Толькі ў зямлі Гашэн, дзе [былі] сыны Ізраіля, не было граду.
27 І паслаў фараон, і паклікаў Майсея і Аарона, і сказаў ім: «Саграшыў я гэтым разам. ГОСПАД
— праведны, а я і народ мой — ліхія.
28 Прасіце ГОСПАДА, бо ўжо досыць грымотаў Божых і граду, і я пушчу вас, і ня будзеце больш
заставацца».
29 І сказаў яму Майсей: «Як толькі выйду з гораду, выцягну далоні свае да ГОСПАДА; грымоты
спыняцца і граду больш ня будзе, каб ты ведаў, што ГОСПАДАВА зямля.
30 Але ты і слугі твае, я ведаю, яшчэ ня маеце страху перад абліччам ГОСПАДА Бога».
31 І лён, і ячмень былі пабітыя, бо ячмень красаваў, а лён квітнеў.
32 А пшаніца і жыта не былі пабітыя, бо яны пазьнейшыя.
33 І выйшаў Майсей ад фараона з гораду, і выцягнуў далоні свае да ГОСПАДА; і спыніліся
грымоты і град, і дождж больш ня ліў на зямлю.
34 І ўбачыў фараон, што спыніліся дождж, і град, і грымоты, і далей грашыў, і закамяніў сэрца
сваё ён сам і слугі ягоныя.
35 І зацьвярдзела сэрца фараона, і ён не адпусьціў сыноў Ізраіля, як і казаў ГОСПАД праз
Майсея.

Вых 10

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Увайдзі да фараона, бо Я закамяніў сэрца ягонае і сэрца слугаў
ягоных, каб рабіць гэтыя знакі Мае пасярод яго,
2 і каб ты распавядаў у вушы сына твайго і сына сына твайго пра тое, што Я зрабіў у Эгіпце, і
пра знакі Мае, якія Я ўчыніў ім, і каб вы ведалі, што Я — ГОСПАД».
3 І ўвайшлі Майсей і Аарон да фараона, і сказалі яму: «Гэтак кажа ГОСПАД, Бог Гебраяў:
“Дакуль ты будзеш адмаўляцца скарыцца перада Мною? Адпусьці народ Мой, і яны будуць
служыць Мне.
4 Бо калі адмовішся адпусьціць народ Мой, вось, Я прывяду заўтра саранчу ў межы твае.
5 І яна пакрые паверхню зямлі, і нельга будзе бачыць зямлі, і паесьць рэшту, што ацалела, што
засталося ў вас пасьля граду, і паесьць кожнае дрэва, якое расьце ў вас на полі.
6 І яна напоўніць дамы твае, і дамы ўсіх слугаў тваіх, і дамы ўсіх Эгіпцянаў, чаго ня бачылі
бацькі твае і бацькі бацькоў тваіх з дня, як былі на зямлі, аж да дня гэтага”». І павярнуўся
[Майсей], і выйшаў ад фараона.

7 І сказалі слугі фараонавы яму: «Дакуль гэта будзе для нас пасткаю? Адпусьці людзей гэтых,
і няхай яны служаць ГОСПАДУ, Богу свайму. Няўжо ты яшчэ не разумееш, што гіне Эгіпет?»
8 І вярнулі Майсея і Аарона да фараона, і ён сказаў ім: «Ідзіце, служыце ГОСПАДУ, Богу вашаму.
Але хто мае пайсьці?»
9 І сказаў Майсей: «Пойдзем з малымі нашымі і са старымі нашымі, з сынамі нашымі і дочкамі
нашымі, пойдзем з авечкамі нашымі і валамі нашымі, бо сьвята ГОСПАДУ ў нас».
10 І сказаў ім [фараон]: «Няхай так будзе ГОСПАД з вамі! Як я адпушчу вас і дзяцей вашых?
Глядзіце, бо ліхое [маеце] перад абліччам сваім.
11 Не, [ня будзе] так. Ідзіце мужчыны і служыце ГОСПАДУ, бо вы гэтага жадалі». І выгналі іх
ад аблічча фараона.
12 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Выцягні руку тваю на зямлю Эгіпецкую дзеля саранчы, і яна
прыйдзе на зямлю Эгіпецкую, і паесьць усю траву зямлі, усё, што пакінуў град».
13 І выцягнуў Майсей кій свой на зямлю Эгіпецкую; і ГОСПАД прывёў на зямлю ўсходні вецер
увесь той дзень і ўсю ноч. Настала раніца, і ўсходні вецер прынёс саранчу.
14 І прыйшла саранча на ўсю зямлю Эгіпецкую, і асела ў-ва ўсіх межах Эгіпецкіх вельмі
ўцяжліва; уперад не было такой саранчы, як гэта, і пасьля яе ня будзе такой.
15 І яна пакрыла паверхню ўсёй зямлі, і зямля пацямнела, і яна паела ўсю траву зямную і ўсе
плады дрэваў, якія засталіся пасьля граду; і не засталося ніякай зеляніны на дрэвах і на траве
палявой у-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай.
16 І пасьпяшаўся фараон паклікаць Майсея і Аарона, і сказаў: «Саграшыў я перад ГОСПАДАМ,
Богам вашым, і перад вамі.
17 І цяпер даруйце, прашу, грэх мой хаця б у гэты раз, і прасіце ГОСПАДА, Бога вашага, каб
толькі Ён прыбраў ад мяне гэтую сьмерць».
18 І выйшаў [Майсей] ад фараона, і прасіў ГОСПАДА.
19 І павярнуў ГОСПАД заходні вецер, вельмі моцны, і ён панёс саранчу, і ўкінуў яе ў Мора
Чырвонае; не засталося аніводнае саранчы ў-ва ўсіх межах Эгіпецкіх.
20 І ГОСПАД зрабіў цьвёрдым сэрца фараона, і ён не адпусьціў сыноў Ізраіля.
21 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Выцягні руку тваю да неба, і станецца цемра на зямлі Эгіпецкай,
і будзе адчувацца цемра».
22 І ён выцягнуў руку сваю да неба, і сталася густая цемра ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай тры дні.
23 Ня бачылі людзі адзін аднаго, і ніхто не ўставаў з месца свайго тры дні; а ў-ва ўсіх сыноў
Ізраіля было сьветла ў сядзібах іхніх.
24 І паклікаў фараон Майсея, і сказаў: «Ідзіце, служыце ГОСПАДУ, толькі авечкі вашыя і валы
вашыя няхай застануцца, і таксама дзеці вашыя няхай ідуць з вамі».
25 І сказаў Майсей: «Таксама ты павінен даць у рукі нашыя ахвяры і цэласпаленьні, і мы зробім
[служэньне] гэта ГОСПАДУ, Богу нашаму.
26 І таксама статак наш пойдзе з намі, і не застанецца ані капыта; бо з яго мы возьмем для
служэньня ГОСПАДУ, Богу нашаму; але мы ня ведаем, чым будзем служыць ГОСПАДУ, пакуль
ня прыйдзем туды».
27 І зрабіў цьвёрдым ГОСПАД сэрца фараона, і ён не захацеў адпусьціць іх.
28 І сказаў [Майсею] фараон: «Ідзі ад мяне! Сьцеражыся, каб ты ня бачыў больш аблічча маё,
бо ў той дзень, калі ты ўбачыш аблічча маё, памрэш».
29 І сказаў Майсей: «Так [станецца, як] ты сказаў. Я больш ня буду бачыць аблічча тваё».

Вых 11

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Яшчэ адну загубу Я навяду на фараона і на Эгіпет. Пасьля гэтага
ён адпусьціць вас адгэтуль. Калі ён будзе адпускаць вас, выганяючы, выганіць вас адгэтуль.
2 Прамоў, прашу, у вушы народу, і няхай мужчына папросіць у бліжняга свайго, і жанчына —
у бліжняй сваёй начыньне срэбнае і начыньне залатое».
3 І даў ГОСПАД ласку народу ў вачах Эгіпцянаў, таксама гэты чалавек Майсей быў вельмі вялікі
ў зямлі Эгіпецкай, у вачах слугаў фараона і ў вачах народу.

4 І сказаў Майсей: «Гэтак кажа ГОСПАД: “Апоўначы Я прайду пасярод Эгіпту.
5 І памрэ кожны першародны ў зямлі Эгіпецкай, ад першароднага фараона, які сядзіць на
пасадзе сваім, да першароднага нявольніцы, якая пры жорнах, і ўсе першародныя скаціны.
6 І будзе крык вялікі ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай такі, што падобнага да яго не было і падобнага
да яго больш ня будзе.
7 А ў сыноў Ізраіля не варухне сабака языком сваім ані на чалавека, ані на скаціну, каб вы
ведалі, што робіць адрозьненьне ГОСПАД паміж Эгіптам і Ізраілем”.
8 І прыйдуць усе гэтыя слугі твае да мяне, і паклоняцца мне, кажучы: “Выйдзі ты і ўвесь народ,
які каля ног тваіх”, і пасьля гэтага я выйду». І выйшаў [Майсей] ад фараона, палаючы гневам.
9 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Не паслухае вас фараон, каб памножыліся цуды Мае ў зямлі
Эгіпецкай».
10 І Майсей і Аарон зрабілі ўсе цуды гэтыя перад фараонам, і зацьвярдзіў ГОСПАД сэрца
фараона, і ён не адпусьціў сыноў Ізраіля з зямлі сваёй.

Вых 12

1 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону ў зямлі Эгіпецкай, кажучы:
2 «Месяц гэты няхай будзе ў вас пачаткам месяцаў; першым няхай ён будзе ў вас месяцам
году.
3 Прамоўце да ўсёй грамады Ізраіля, кажучы: “У дзясяты [дзень] гэтага месяца няхай возьме
сабе кожны ягня для дому бацькоў, ягня на дом.
4 І калі малы дом, каб [спажыць] ягня, няхай возьме ён і сусед найбліжэйшы да дому ягонага,
паводле ліку душаў; паводле таго, колькі кожны зьесьць, палічыце на ягня.
5 Ягня беззаганнае, самец аднагодак мае быць у вас; з авечак альбо з козаў возьмеце [яго].
6 І будзеце захоўваць яго да чатырнаццатага дня гэтага месяца. І зарэжа яго ўся царква
грамады Ізраіля адвячоркам.
7 І возьмуць кроў [ягоную], і памажуць абодва вушакі і вершнікі ў дамах, у якіх будуць есьці
яго.
8 І будуць есьці ў гэтую ноч мяса [ягонае], сьпечанае на агні, і праснакі; з горкімі травамі
будуць есьці [яго].
9 Ня ешце з яго сырога або зваранага ў вадзе, але сьпечанае на агні, галаву ягоную з галёнкамі
ягонымі і нутром ягоным.
10 І не пакідайце [нічога] з яго да раніцы; і тое, што застанецца з яго да раніцы, спаліце на агні.
11 І гэтак будзеце есьці яго: няхай будуць сьцёгны вашыя падперазаныя, абутак ваш — на нагах
вашых і кій ваш — у руцэ вашай, і ешце яго пасьпешліва. Гэта — Пасха для ГОСПАДА”.
12 І Я прайду па зямлі Эгіпецкай у гэтую ноч, і заб’ю кожнага першароднага ў зямлі Эгіпецкай,
ад чалавека аж да скаціны, і над усімі багамі Эгіпту Я ўчыню суды. Я — ГОСПАД.
13 І будзе для вас кроў знакам на дамах, у якіх вы будзеце, і Я ўбачу кроў, і абміну вас, і ня
будзе сярод вас плягі зьнішчэньня, калі Я буду забіваць у зямлі Эгіпецкай.
14 І будзе дзень гэты для вас на ўспамін, і будзеце сьвяткаваць яго як сьвята для ГОСПАДА ў
пакаленьнях вашых; як пастанову вечную будзеце сьвяткаваць яго.
15 Сем дзён будзеце есьці праснакі; і ўжо ў першы дзень прыміце кісьлю з дамоў вашых;
бо кожны, хто будзе есьці кіслае з першага дня да сёмага дня, душа таго будзе выгублена з
Ізраілю.
16 А ў першы дзень — сьвяты збор, і ў сёмы дзень сьвяты збор будзе ў вас, ніякай работы ня
будзеце рабіць у іх; толькі тое, што есьці кожнай душы, адно тое можна рабіць вам.
17 І захоўвайце [Сьвята] Праснакоў, бо ў гэты дзень Я вывеў войска вашае з зямлі Эгіпецкай; і
захоўвайце гэты дзень у пакаленьнях вашых як пастанову вечную.
18 У першы [месяц], у чатырнаццаты дзень месяца з вечара будзеце есьці праснакі аж да вечара
дваццаць першага дня таго самага месяца.
19 Сем дзён кісьля няхай ня знойдзецца ў дамах вашых; бо хто будзе есьці кіслае, выгублена
будзе душа тая з грамады Ізраіля, ці гэта прыхадзень, ці той, што нарадзіўся ў гэтай зямлі.
20 Нічога кіслага ня будзеце есьці; у-ва ўсіх сядзібах вашых будзеце есьці праснакі».

21 І паклікаў Майсей усіх старшыняў Ізраіля, і сказаў ім: «Выберыце і вазьміце сабе ягнятка паводле плямёнаў вашых і зарэжце яго [як ахвяру] пасхальную.
22 І вазьміце вязку ізопу, і занурыце ў кроў, якая ў мядніцы, і памажаце вершнік і абодва вушакі крывёю, якая ў мядніцы, і вы самі не выходзьце ніхто за дзьверы дому свайго аж да раніцы.
23 І пойдзе ГОСПАД, каб губіць Эгіпет, і ўбачыць кроў на вершніку і на абодвух вушаках, і пройдзе ГОСПАД каля дзьвярэй, і ня дасьць нішчыцелю ўвайсьці ў дамы вашыя, каб губіць.
24 І будзеце захоўваць слова гэтае, як пастанову для сябе і для сыноў вашых на вякі.
25 І станецца, што, калі вы ўвойдзеце ў зямлю, якую дасьць вам ГОСПАД, як Ён казаў, вы будзеце захоўваць служэньне гэтае.
26 І станецца, што скажуць вам сыны вашыя: “Што гэта за служэньне ў вас?",
27 а вы адкажаце: “Гэта ахвяра — Пасха для ГОСПАДА, Які абмінуў дамы сыноў Ізраіля ў Эгіпце, калі губіў Эгіпет, а дамы нашыя захаваў”». І схіліўся народ, і пакланіўся.
28 І пайшлі, і зрабілі сыны Ізраіля; як загадаў ГОСПАД Майсею і Аарону, так і зрабілі.
29 І сталася а палове ночы, і забіў ГОСПАД усіх першародных у зямлі Эгіпецкай, ад першароднага фараона, які сядзеў на пасадзе сваім, аж да першароднага вязьня, які ў вязьніцы, і ўсіх першародных у жывёлы.
30 І ўстаў фараон уначы, сам і ўсе слугі ягоныя, і ўвесь Эгіпет; і сталася вялікае галашэньне ў Эгіпце, бо не было дому, у якім не было б памерлага.
31 І паклікаў ён Майсея і Аарона ўначы, і сказаў: «Устаньце, выйдзіце з асяродзьдзя народу майго, і вы, і таксама сыны Ізраіля, і ідзіце, служыце ГОСПАДУ, як вы казалі.
32 Таксама авечак вашых, таксама валоў вашых вазьміце, як вы казалі, і ідзіце, і дабраславіце таксама мяне».
33 І прысьпешвалі Эгіпцяне народ, каб хутчэй выслаць яго з зямлі той, бо яны казалі: «Усе мы памром».
34 І панёс народ цеста сваё перш, чым яно скісла, дзежы свае, завязаныя ў шаты свае, на плячах сваіх.
35 І сыны Ізраіля зрабілі паводле слова Майсея, і пазычылі ў Эгіпцянаў начыньне срэбнае і начыньне залатое, і адзеньне.
36 І ГОСПАД даў ласку народу ў вачах Эгіпцянаў, і яны пазычалі ім; і абрабавалі яны Эгіпет.
37 І вырушылі сыны Ізраіля з Рамсэса ў Сукот [у ліку] каля шасьцісот тысячаў пешых мужчынаў, апрача дзяцей.
38 Таксама мноства плямёнаў выйшла з імі, і авечкі, і валы, набытак вельмі вялікі.
39 І сьпяклі яны з цеста, якое вынесьлі з Эгіпту, прэсныя аладкі, бо яно яшчэ ня скісла, бо яны былі выгнаныя з Эгіпту і не маглі затрымацца, і нават ежы не прыгатавалі сабе [ў дарогу].
40 А [час] аселасьці сыноў Ізраіля, колькі яны жылі ў Эгіпце, быў чатырыста трыццаць гадоў.
41 І сталася па заканчэньні чатырыста трыццаці гадоў, што ў гэтым самы дзень выйшла ўсё войска ГОСПАДА з зямлі Эгіпецкай.
42 Гэта ноч чуваньня для ГОСПАДА, калі Ён вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, і гэтая самая ноч — чуваньне перад ГОСПАДАМ для ўсіх сыноў Ізраіля ў пакаленьні іхнія.
43 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону: «Вось пастанова Пасхі: ніякі чужынец ня будзе есьці яе.
44 А кожны слуга — чалавек, набыты за срэбра, калі ты абрэжаш яго, можа есьці яе.
45 Прыхадзень і найміт ня будзе есьці яе.
46 У адным доме маеце есьці яе, не выносьце мяса вонкі з дому, і косткі яе не ламіце.
47 Уся грамада Ізраіля мае рабіць гэта.
48 І калі чужынец будзе жыць з табою, і [захоча] ўчыніць Пасху ГОСПАДА, абрэж у яго ўсіх мужчынаў, і тады няхай наблізіцца, каб рабіць яе, і будзе ён як тутэйшы ў зямлі; але ніхто неабрэзаны ня будзе есьці яе.
49 Адзін закон будзе для тутэйшага і для чужынца, што жыве сярод вас».
50 І зрабілі гэта ўсе сыны Ізраіля; як ГОСПАД загадаў Майсею і Аарону, так і зрабілі.
51 І сталася, што ў той самы дзень ГОСПАД вывеў сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай паводле дружынаў іхніх.

Вых 13

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Пасьвяці Мне ўсіх першародных, што адкрываюць усякае ўлоньне ў сыноў Ізраіля, у
чалавека і ў жывёлы. Мае яны».
3 І сказаў Майсей народу: «Памятайце гэты дзень, у які вы выйшлі з Эгіпту, з дому няволі, бо
рукою моцнаю вывеў вас ГОСПАД адгэтуль, і ня ешце кіслага.
4 Сёньня вы выходзіце ў месяцы Авіў.
5 І будзе, калі ўвядзе вас ГОСПАД у зямлю Хананейца, і Хета, і Амарэя, і Хівея, і Евусэя, пра
якую Ён прысягаў бацькам тваім, што дасьць табе зямлю, якая цячэ малаком і мёдам, захоўвай
служэньне гэтае ў месяцы гэтым.
6 Сем дзён будзеш есьці праснакі, а ў сёмы дзень — сьвята для ГОСПАДА.
7 Праснакі будзеш есьці сем дзён; і ня будзе бачана ў цябе кіслага, і ня будзе бачана ў цябе
кісьлі ў-ва ўсіх межах тваіх.
8 І распавядзеш сыну твайму ў гэты дзень, кажучы: “Гэта дзеля таго, што зрабіў ГОСПАД мне,
калі я выходзіў з Эгіпту”.
9 І будзе для цябе гэта знакам на руцэ тваёй і памяткаю між вачыма тваімі, каб Закон ГОСПАДА
быў на вуснах тваіх, бо рукою моцнаю вывеў цябе ГОСПАД з Эгіпту.
10 І будзеш захоўваць пастанову гэтую ў вызначаны час з году ў год.
11 І станецца, што ўвядзе цябе ГОСПАД у зямлю Хананейца, як Ён прысягаў табе і бацькам
тваім, і дасьць яе табе.
12 І ты аддзеліш усё, што адкрывае ўлоньне, для ГОСПАДА, і ўсё першароднае, што адкрывае
[ўлоньне] ў жывёлы, якое будзе тваё, мужчынскага роду — для ГОСПАДА.
13 І кожнага асла, які адкрывае [ўлоньне], выкупіш баранчыкам; а калі ня выкупіш, зламі карак
ягоны; і кожнага першароднага чалавека з сыноў сваіх выкупіш.
14 І станецца, што спытаецца ў цябе сын твой заўтра, кажучы: “Што гэта?”, і ты скажы яму:
“Моцнаю рукою вывеў нас ГОСПАД з Эгіпту, з дому няволі.
15 І сталася, што зацяўся фараон, каб не адпусьціць нас, і забіў ГОСПАД усіх першародных
у зямлі Эгіпецкай, ад першароднага чалавека аж да першароднага жывёлы. Дзеля гэтага я
ахвярую ГОСПАДУ ўсіх самцоў, якія адкрываюць улоньне, і ўсіх першародных сыноў маіх
выкупляю”.
16 І будзе [гэта] знакам на руцэ тваёй і павязкаю між вачэй тваіх, бо моцнаю рукою вывеў нас
ГОСПАД з Эгіпту».
17 І сталася, калі адпусьціў фараон народ, не павёў іх Бог па шляху зямлі Філістынскай, хоць
яна блізкая, бо сказаў Бог: «Каб не пашкадаваў народ, калі ўбачыць вайну, і не вярнуўся ў
Эгіпет».
18 І павёў Бог народ шляхам пустыні да мора Чырвонага. І выйшлі збройныя сыны Ізраіля з
зямлі Эгіпецкай.
19 І ўзяў Майсей з сабою косткі Язэпа, бо прысягаю запрысяг Язэп сыноў Ізраіля, кажучы:
«Наведваючы, наведае вас Бог, і вы вынясіце з сабою косткі мае адгэтуль».
20 І вырушылі з Сукоту, і сталі табарам у Этаме, на скраю пустыні.
21 І ГОСПАД ішоў перад імі ўдзень у слупе воблачным, каб весьці іх па дарозе, а ўначы — у слупе
вогненым, каб сьвяціць ім, каб [маглі] ісьці ўдзень і ўначы.
22 Не адыходзіў слуп воблачны ўдзень і слуп вогнены ўначы ад аблічча народу.

Вых 14

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Скажы сынам Ізраіля, каб яны павярнуліся і сталі табарам перад Пі-Гахіротам, між
Мігдолам і морам, перад Баал-Цэфонам. Насупраць яго станьце табарам каля мора.
3 І скажа фараон пра сыноў Ізраіля: “Яны заблукалі ў зямлі гэтай, замкнула іх пустыня”.
4 І Я зраблю цьвёрдым сэрца фараона, і ён пагоніцца за імі, і Я ўслаўлюся над фараонам і над
усім войскам ягоным; і пазнаюць Эгіпцяне, што Я — ГОСПАД». І зрабілі гэтак.

5 І паведамілі валадару Эгіпецкаму, што народ уцёк; і павярнулася сэрца фараона і слугаў
ягоных супраць народу [Ізраіля], і сказалі яны: «Што гэта мы зрабілі, што адпусьцілі
Ізраільцянаў са службы нам?»
6 І запрог ён калясьніцу сваю, і народ свой узяў з сабою.
7 І ўзяў шэсьцьсот калясьніцаў выборных, і ўсе калясьніцы Эгіпецкія, і па тры [ваяры] на
кожнай з іх.
8 І зацьвярдзіў ГОСПАД сэрца фараона, валадара Эгіпту, і ён пагнаўся за сынамі Ізраіля; а сыны
Ізраіля выйшлі пад рукою ўзьнятаю.
9 І пагналіся Эгіпцяне за імі, і ўсе коні і калясьніцы фараона, і вершнікі ягоныя, і ўсё войска
ягонае дагналі іх, калі тыя стаялі табарам каля мора, каля Пі-Гахіроту насупраць Баал-Цэфону.
10 І фараон наблізіўся, і ўзьнялі сыны Ізраіля вочы свае, і вось, Эгіпет рушыць за імі, і моцна
напужаліся, і клікалі сыны Ізраіля да ГОСПАДА.
11 І сказалі Майсею: «Ці ж не было магілаў у Эгіпце, што ты ўзяў нас паміраць у пустыні? Што
гэта ты зрабіў нам, што вывеў нас з Эгіпту?
12 Ці ня гэтае слова гаварылі мы табе ў Эгіпце, кажучы: “Пакінь нас, і мы будзем служыць у
Эгіпцянаў”? Бо лепш нам служыць у Эгіпцянаў, чым паміраць у пустыні».
13 І сказаў Майсей народу: «Ня бойцеся! Стойце і ўбачыце збаўленьне ГОСПАДА, якое Ён
учыніць для вас сёньня. Бо Эгіпцянаў, якіх вы бачыце сёньня, больш ня ўбачыце ўжо на вякі.
14 ГОСПАД будзе ваяваць за вас, а вы маўчыце».
15 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Чаго ты клічаш да Мяне? Прамоў да сыноў Ізраіля, і няхай
вырушаць [у дарогу].
16 А ты ўзьнімі кій твой і выцягні руку тваю на мора, і расьсячы яго, і ўвойдуць сыны Ізраіля ў
сярэдзіну мора па сухому.
17 А Я, вось, зраблю цьвёрдым сэрца Эгіпцянаў, і яны ўвойдуць за імі, і Я ўслаўлюся над
фараонам і над усім войскам ягоным, над калясьніцамі ягонымі і над вершнікамі ягонымі.
18 І даведаецца Эгіпет, што Я — ГОСПАД, калі Я ўслаўлюся над фараонам, над калясьніцамі
ягонымі і над вершнікамі ягонымі».
19 І рушыў анёл Божы, які ішоў перад табарам Ізраіля, і пайшоў ззаду іх. І рушыў слуп воблачны
ад аблічча іхняга, і стаў ззаду іх,
20 і ўвайшоў паміж табарам Эгіпецкім і табарам Ізраільскім, і быў хмарай і цемраю [для
адных], і асьвятляў ноч [для другіх]; і не наблізіліся адны да адных праз усю ноч.
21 І выцягнуў Майсей руку сваю на мора, і гнаў ГОСПАД мора гвалтоўным усходнім ветрам
усю ноч, і зрабіў мора сухменем, і расьсекліся воды.
22 І прайшлі сыны Ізраіля па сярэдзіне мора па сухому, і воды былі для іх мурам праваруч іх і
леваруч іх.
23 І пагналіся Эгіпцяне, і пайшлі за імі ў сярэдзіну мора ўсе коні фараона, калясьніцы ягоныя
і вершнікі ягоныя.
24 І сталася ў ранішнюю варту, і глянуў ГОСПАД на табар Эгіпцянаў са слупа вогненнага і
воблачнага, і зьмяшаў табар Эгіпцянаў.
25 І затрымаў колы калясьніцаў іхніх, і яны цягнулі іх з цяжкасьцю. І сказаў Эгіпет: «Уцякайма
ад аблічча Ізраіля, бо ГОСПАД змагаецца за іх супраць Эгіпту!»
26 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Выцягні руку тваю на мора, і няхай вернуцца воды на Эгіпет, на
калясьніцы ягоныя і на вершнікаў ягоных».
27 І выцягнуў Майсей руку сваю на мора, і вярнула мора сілу сваю на сьвітаньні, а Эгіпцяне
ўцякалі напярэймы яму; і кінуў ГОСПАД Эгіпцянаў у сярэдзіну мора.
28 І вярнуліся воды, і пакрылі калясьніцы і вершнікаў усяго войска фараона, якія ўвайшлі за
імі ў мора; не засталося з іх аніводнага.
29 А сыны Ізраіля ішлі па сухому па сярэдзіне мора, і воды былі для іх мурам праваруч іх і
леваруч іх.
30 І выбавіў ГОСПАД у дзень гэты Ізраіля з рукі Эгіпцянаў; і ўбачыў Ізраіль Эгіпет мёртвым на
беразе мора.

31 І ўбачыў Ізраіль руку вялікую, якую зьявіў ГОСПАД над Эгіптам; і баяўся народ ГОСПАДА, і
паверылі ГОСПАДУ і Майсею, слузе Ягонаму.

Вых 15

1 Тады засьпяваў Майсей і сыны Ізраіля гэты сьпеў ГОСПАДУ, і сказалі, кажучы: «Засьпяваю
ГОСПАДУ, бо, узьвялічваючыся, узьвялічыўлся Ён; каня і вершніка ягонага ўкінуў у мора.
2 Сіла мая і песьня — ГОСПАД, і Ён стаўся для мяне збаўленьнем. Ён — Бог мой, і я ўслаўляю
Яго, [Ён —] Бог бацькі майго, і я вывышаю Яго.
3 ГОСПАД — Муж вайны, ГОСПАД — імя Ягонае.
4 Калясьніцы фараона і войска ягонае Ён укінуў у мора, і выборныя ваяры ягоныя патанулі ў
моры Чырвоным.
5 Бездані пакрылі іх, яны пайшлі ў глыбіні, як камень.
6 Правіца Твая, ГОСПАДЗЕ, праславілася моцаю; правіца Твая, ГОСПАДЗЕ, скрышыла ворага.
7 І ў велічы маестату Твайго Ты зруйнаваў тых, што паўсталі супраць Цябе. Ты паслаў гнеў
Твой, і ён спаліў іх, як салому.
8 І ад подыху гневу Твайго сабраліся воды, сталіся як копы струмяні, сьселіся бездані ў сэрцы
мора.
9 Вораг сказаў: “Буду гнацца, даганю, падзялю здабычу; насыціцца імі душа мая, выхаплю меч
мой, схопіць іх рука мая”.
10 Ты павеяў духам Тваім, і пакрыла іх мора. Яны патанулі, як волава, у водах магутных.
11 Хто, як Ты, ГОСПАДЗЕ, між багамі? Хто, як Ты, праслаўлены ў сьвятасьці, страшны ў хвале,
Той, Які робіць цуды?
12 Ты выцягнуў правіцу Тваю, праглынула іх зямля.
13 Ты вёў у міласэрнасьці Тваёй народ, які Ты адкупіў, прывёў сілаю Тваёю ў жытло сьвятасьці
Тваёй.
14 Пачулі народы, задрыжалі; болі ахапілі жыхароў Філістынскіх.
15 Тады спалохаліся князі Эдому, моцных Мааву ахапіла дрыжаньне, млеюць усе жыхары
Ханаану.
16 Няхай ахопіць іх жах і баязьлівасьць. Ад вялікасьці рамяна Твайго замоўкнуць яны як
камень, аж пакуль пройдзе народ Твой, ГОСПАДЗЕ, пакуль пройдзе народ гэты, які Ты набыў
[для Сябе].
17 Ты завядзеш іх і пасадзіш іх на гары спадчыны Тваёй, на месцы, якое Ты, ГОСПАДЗЕ, учыніў
на жытло, сьвятыню, Госпадзе, якую ўгрунтавалі рукі Твае.
18 ГОСПАД будзе валадарыць на вякі вечныя.
19 Бо ўвайшоў конь фараона з калясьніцамі ягонымі і з вершнікамі ягонымі ў мора, і абрынуў
ГОСПАД на іх воды мора, а сыны Ізраіля прайшлі па сухому па сярэдзіне мора».
20 І ўзяла Мірыям прарочыца, сястра Аарона, бубен у руку сваю, і выйшлі за ёю ўсе жанчыны
з бубнамі і танцамі.
21 І адказала ім Мірыям: «Сьпявайце ГОСПАДУ, бо ўзьвялічваючыся, узьвялічыўся Ён; каня і
вершніка ягонага ўкінуў у мора».
22 І павёў Майсей Ізраіль ад мора Чырвонага, і яны ўвайшлі ў пустыню Шур; і ішлі яны тры дні
па пустыні, і не знайшлі вады.
23 І прыйшлі ў Мару, і не маглі піць ваду ў Мары, бо яна была горкая; таму назвалі яе Мара.
24 І наракаў народ на Майсея, кажучы: «Што будзем піць?»
25 І клікаў [Майсей] да ГОСПАДА, і паказаў яму ГОСПАД дрэва, і ён кінуў яго ў ваду, і стала
салодкая вада. Там Ён даў яму пастановы і суд, і там выспрабаваў яго,
26 і сказаў: «Калі ты будзеш, слухаючы, слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і робячы, будзеш
рабіць тое, што правільнае ў вачах Ягоных, і прыхіліш вуха да прыказаньняў Ягоных, і будзеш
захоўваць усе пастановы Ягоныя, ніводнае з немачаў, якія Я навёў на Эгіпет, не навяду на цябе,
бо Я — ГОСПАД, Лекар твой».

27 І прыйшлі яны ў Элім. Там было дванаццаць крыніцаў вады і семдзясят пальмаў; і сталі там
табарам каля водаў.

Вых 16

1 І вырушылі з Эліму, і прыйшла ўся грамада сыноў Ізраіля ў пустыню Сін, якая паміж Элімам
і Сынаем, у пятнаццаты дзень другога месяца пасьля выхаду іхняга з зямлі Эгіпецкай.
2 І наракала, і наракала ўся грамада сыноў Ізраіля на Майсея і Аарона ў пустыні.
3 І сказалі ім сыны Ізраіля: «Лепш бы мы памерлі ад рукі ГОСПАДА ў зямлі Эгіпецкай, калі
мы сядзелі пры катлах з мясам, калі мы елі хлеб да насычэньня! Бо вы вывелі нас у гэтую
пустыню, каб памерла з голаду ўся царква гэтая».
4 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вось, Я спашлю вам, як дождж, хлеб з неба; і выйдзе народ, і будзе
зьбіраць штодня патрэбнае на дзень, каб Я выпрабаваў яго, ці будзе ён хадзіць паводле закону
Майго, ці не.
5 І станецца ў шосты дзень, і прыгатуеце тое, што прынясуць, і будзе падвойная [мера] адносна
таго, што вы зьбіралі дзень пры дні».
6 І сказаў Майсей і Аарон усім сынам Ізраіля: «[Будзе] вечар, і вы пазнаеце, што ГОСПАД вывеў
вас з зямлі Эгіпецкай.
7 А [будзе], раніца, і вы ўбачыце славу ГОСПАДА, бо Ён пачуў нараканьне вашае на ГОСПАДА; а
мы, хто мы, што вы наракаеце і наракаеце на нас?»
8 І сказаў Майсей: «[Гэта будзе], калі дасьць ГОСПАД увечары вам мяса на ежу, а раніцаю —
хлеб, каб насыціцца, бо ГОСПАД пачуў нараканьне вашае, як вы наракалі на Яго. А мы, што
мы? Не на нас нараканьне вашае, але на ГОСПАДА».
9 І сказаў Майсей Аарону: «Скажы ўсёй грамадзе сыноў Ізраіля: “Наблізьцеся перад аблічча
ГОСПАДА, бо Ён пачуў нараканьне вашае”».
10 І сталася, калі гаварыў Аарон да ўсёй грамады сыноў Ізраіля, і яны зьвярнуліся ў бок
пустыні, і вось, слава ГОСПАДА зьявілася ў воблаку.
11 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
12 «Я пачуў нараканьне сыноў Ізраіля. Прамоў да іх, кажучы: “Адвячоркам будзеце есьці мяса,
а раніцаю насыціцеся хлебам, і пазнаеце, што Я — ГОСПАД, Бог ваш”».
13 І сталася ўвечары, і наляцелі перапёлкі, і пакрылі табар, а раніцаю быў пласт расы вакол
табару.
14 І падняўся пласт расы, і вось, на абліччы пустыні [нешта] дробнае і крупчастае, дробнае, як
шэрань на зямлі.
15 І ўбачылі сыны Ізраіля, і казалі адзін аднаму: «Што гэта?» Бо ня ведалі, што гэта. І сказаў
ім Майсей: «Гэта хлеб, які ГОСПАД даў вам есьці.
16 Гэта слова, якое загадаў ГОСПАД: “Зьбірайце яго кожны паводле таго, колькі яму зьесьці,
па гомару на галаву, паводле ліку душаў вашых. Кожны будзе зьбіраць для тых, якія ў намёце
ягоным"».
17 І зрабілі так сыны Ізраіля, і сабралі хто больш, а хто менш.
18 І мералі гомарам, і не было лішку ў таго, хто сабраў больш, і не было нястачы ў таго, хто
[сабраў] менш. Кожны сабраў паводле таго, колькі яму зьесьці.
19 І сказаў ім Майсей: «Няхай ніхто не пакіне з яго да раніцы».
20 І не паслухалі яны Майсея, і некаторыя пакінулі з яго да раніцы; і завяліся ў ім чэрві, і яно
стала сьмярдзець. І разгневаўся на іх Майсей.
21 І яны зьбіралі гэта раніцай пры раніцы, кожны паводле таго, колькі яму зьесьці. І калі
прыпякала сонца, яно раставала.
22 І сталася ў шосты дзень, што сабралі хлеба падвойную [меру], па два гомары на аднаго
[чалавека], і прыйшлі ўсе начальнікі грамады, і паведамілі Майсею.
23 І ён сказаў ім: «Гэта тое, што гаварыў ГОСПАД, заўтра супачынак, святая субота для
ГОСПАДА. Што маеце пячы — пячыце, і што маеце варыць — варыце, а што застанецца, пакіньце
сабе на схоў да раніцы».

24 І пакінулі гэта да раніцы, як загадаў Майсей, і яно не засьмярдзела, і чарвей не было ў ім.
25 І сказаў Майсей: «Ешце яго сёньня, бо сёньня — субота для ГОСПАДА; сёньня ня знойдзеце
яго на полі.
26 Шэсьць дзён будзеце зьбіраць яго; а сёмы дзень — субота, ня будзе ў ёй [гэтага]».
27 І сталася ў сёмы дзень, выйшлі [некаторыя] з народу зьбіраць, і не знайшлі.
28 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Як доўга будзеце адмаўляцца захоўваць прыказаньні Мае і
законы Мае?
29 Глядзіце, бо ГОСПАД даў вам суботу; дзеля гэтага Ён дае вам у шосты дзень хлеба на два дні.
Заставайцеся кожны ў сябе, няхай не выходзіць ніхто з месца свайго ў сёмы дзень».
30 І супачыў народ у сёмы дзень.
31 І назваў дом Ізраіля імя ягонае — “манна”, і яна была як насеньне каляндры, белая, а смак
ягоны — як печыва з мёдам.
32 І сказаў Майсей: «Вось слова, якое загадаў ГОСПАД: “Поўны гомар [пакіньце] на захаваньне
ў пакаленьні вашыя, каб бачылі хлеб, якім Я карміў вас у пустыні, калі вывеў вас з зямлі
Эгіпецкай”».
33 І сказаў Майсей Аарону: «Вазьмі адну пасудзіну, і палажы ў яе поўны гомар манны, і пастаў
яе перад абліччам ГОСПАДА на захаваньне ў пакаленьні вашыя».
34 Як загадаў ГОСПАД Майсею, так паставіў яго Аарон перад [Каўчэгам] Сьведчаньня на
захаваньне.
35 А сыны Ізраіля елі манну сорак гадоў, пакуль не прыйшлі ў зямлю абжытую; яны елі манну,
пакуль не прыйшлі да межаў зямлі Ханаан.
36 А гомар — гэта дзясятая частка эфы.

Вых 17

1 І вырушыла ўся грамада сыноў Ізраіля з пустыні Сін у падарожжы свае, паводле [слова з]
вуснаў ГОСПАДА, і сталі табарам у Рэфідыме, і не было вады, каб піць народу.
2 І спрачаўся народ з Майсеем, і сказалі: «Дайце нам вады, і будзем піць». І сказаў ім Майсей:
«Што вы спрачаецеся са мною? Што выпрабоўваеце ГОСПАДА?».
3 І смагнуў там народ вады, і наракаў народ на Майсея, і сказаў: «Навошта ты вывеў нас з
Эгіпту? Каб памерлі ад смагі я, і сыны мае, і статак мой?»
4 І клікаў Майсей да ГОСПАДА, кажучы: «Што мне рабіць з народам гэтым? Яшчэ крыху, і яны
ўкамянуюць мяне».
5 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Прайдзі перад абліччам народу, і вазьмі з сабою старшыняў
Ізраіля, і кій твой, якім ты ўдарыў раку, возьмеш у руку тваю, і пойдзеш.
6 Вось, Я стану перад абліччам тваім там на скале на Харэве, і ты ўдарыш у скалу, і выйдзе з яе
вада, і будзе піць народ». І зрабіў так Майсей на вачах старшыняў Ізраіля.
7 І назваў імя месца таго — Маса і Мэрыва, таму што сварыліся сыны Ізраіля і таму што яны
выпрабоўвалі ГОСПАДА, кажучы: «Ці ёсьць ГОСПАД сярод нас, ці не?»
8 І прыйшоў Амалек, і ваяваў з Ізраілем у Рэфідыме.
9 І сказаў Майсей Егошуа: «Выбяры нам мужоў і ідзі, каб ваяваць з Амалекам. Заўтра я стану
на вяршыні ўзгорку, і кій Божы [будзе] ў руцэ маёй».
10 І зрабіў Егошуа так, як сказаў яму Майсей, каб ваяваць з Амалекам; а Майсей, Аарон і Хур
узыйшлі на вяршыню ўзгорку.
11 І было, што калі Майсей падымаў руку сваю, перамагаў Ізраіль; а калі апускаў руку сваю,
перамагаў Амалек.
12 І рукі Майсея сталіся цяжкімі; і ўзялі камень, і падлажылі пад яго; і ён сеў на ім. І Аарон і Хур
падпіралі рукі ягоныя, адзін з аднаго, а другі — з другога боку. І рукі ягоныя былі ўзьнятыя аж
да заходу сонца.
13 І перамог Егошуа Амалека і народ ягоны лязом мяча.
14 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Запішы гэта на памятку ў кнігу, і ўлажы ў вушы Егошуа, што Я
вынішчаючы, вынішчу памяць пра Амалека пад небам!».
15 І пабудаваў Майсей ахвярнік, і назваў імя яго: “ГОСПАД — сьцяг мой”.

16 І сказаў ён: «Бо рука на пасадзе ГОСПАДА, што вайна ў ГОСПАДА з Амалекам з пакаленьня ў
пакаленьне».

Вых 18

1 І пачуў Етра, сьвятар Мадыянскі, цесьць Майсея, пра ўсё, што зрабіў Бог для Майсея і Ізраіля,
народу Свайго, бо вывеў ГОСПАД Ізраіля з Эгіпту.
2 І ўзяў Етра, цесьць Майсея, Цыпору, жонку Майсея, якую той быў адаслаўшы,
3 і двух сыноў ейных, у якіх аднаго імя — Гершом, бо казаў Майсей: «Я стаўся прыхаднем у
зямлі чужой»,
4 а імя другога — Эліезэр, бо [казаў]: «Бог бацькі майго [быў] дапамогай маёй і выбавіў мяне
ад мяча фараона».
5 І прыйшоў Етра, цесьць Майсея, і сыны ягоныя, і жонка ягоная да Майсея ў пустыню, дзе ён
стаяў табарам каля гары Божай,
6 і сказаў Майсею: «Я, цесьць твой Етра, прыйшоў да цябе, і жонка твая, і два сыны ейныя з
ёю».
7 І выйшаў Майсей насустрач цесьцю свайму, і пакланіўся, і пацалаваў яго, і пыталіся адзін у
аднаго, як маюцца, і ўвайшлі ў намёт.
8 І распавёў Майсей цесьцю свайму пра ўсё, што зрабіў ГОСПАД з фараонам і Эгіптам з
прычыны Ізраіля, і пра ўсе цяжкасьці, якія напаткалі іх у дарозе, і як выбавіў іх ГОСПАД.
9 І радаваўся Етра з усяго дабра, якое ГОСПАД зрабіў для Ізраіля, калі выбавіў яго з рукі
Эгіпцянаў.
10 І сказаў Етра: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Які выбавіў вас з рукі Эгіпцянаў і з рукі фараона, Які
выбавіў народ з-пад рукі Эгіпцянаў.
11 Цяпер я ведаю, што большы ГОСПАД за ўсіх багоў, бо ў той справе, у якой яны выхваляліся,
Ён быў па-над імі».
12 І ўзяў Етра, цесьць Майсея, цэласпаленьне і ахвяры для Бога, і прыйшоў Аарон і ўсе старшыні
Ізраіля, каб есьці хлеб з цесьцем Майсея перад абліччам Бога.
13 І сталася назаўтра, і сеў Майсей судзіць народ, і стаяў народ перад Майсеем з раніцы да
вечара.
14 І бачыў цесьць Майсея ўсё, што ён рабіў для народу, і сказаў: «Што гэта за справа, якую ты
робіш для народу? Дзеля чаго ты сядзіш сам адзін, а ўвесь народ стаіць перад табою з раніцы
да вечара?»
15 І сказаў Майсей цесьцю свайму: «Бо прыходзіць народ да мяне, каб пытацца ў Бога.
16 Бо калі яны маюць нейкую справу, прыходзяць да мяне, і я суджу паміж адным [чалавекам]
і другім, і абвяшчаю пастановы Божыя і законы Ягоныя».
17 І сказаў цесьць Майсея яму: «Нядобрая гэтая рэч, якую ты робіш.
18 Мучаешся ты і мучаеш народ гэты, які з табою; бо цяжкая для цябе справа гэтая, ты ня
можаш рабіць яе сам адзін.
19 Цяпер паслухай голас мой; я дам табе раду, і будзе Бог з табою. Ты будзь [заступнікам] за
народ перад Богам і прынось Богу справы гэтыя.
20 І ты навучай іх пастановам і законам, і дай ім ведаць шлях, па якім яны маюць ісьці, і ўчынкі,
якія яны маюць рабіць.
21 І ты выглядзі з усяго народу людзей здольных, якія баяцца Бога, людзей праўды, якія
ненавідзяць хцівасьць, і пастаў іх як начальнікаў над тысячамі, начальнікаў над сотнямі,
начальнікаў над пяцідзясяткамі і начальнікаў над дзясяткамі.
22 І няхай яны судзяць народ у кожным часе. І станецца, што кожную справу вялікую яны
будуць прыносіць да цябе, а кожную справу малую будуць судзіць самі. І будзе табе лягчэй, і
яны панясуць [цяжар] з табою.
23 Калі гэтую рэч зробіш, і Бог загадае [гэта] табе, ты зможаш стаяць, і таксама ўвесь народ
гэты прыйдзе на сваё месца ў супакоі».
24 І паслухаў Майсей голасу цесьця свайго, і зрабіў усё, што той сказаў.

25 І выбраў Майсей людзей здольных з усяго Ізраіля, і прызначыў іх галоўнымі над народам,
начальнікамі над тысячамі, начальнікамі над сотнямі, начальнікамі над пяцідзясяткамі і
начальнікамі над дзесяткамі.
26 І судзілі яны народ у кожным часе, справу цяжкую прыносілі да Майсея, а кожную справу
малую судзілі самі.
27 І адпусьціў Майсей цесьця свайго, і той пайшоў у зямлю сваю.

Вых 19

1 У трэці месяц пасьля выхаду сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай, у першы дзень прыйшлі яны ў
пустыню Сынай.
2 І вырушылі яны з Рэфідыму, і прыйшлі ў пустыню Сынай, і сталі табарам у пустыні; і стаў
табарам там Ізраіль насупраць гары.
3 А Майсей узыйшоў да Бога, і паклікаў яго ГОСПАД з гары, кажучы: «Гэтак скажы дому Якуба
і паведамі сынам Ізраіля:
4 “Вы бачылі, што Я зрабіў Эгіпту, а вас насіў на крылах арліных, і прынёс вас да Сябе.
5 І цяпер, калі вы, слухаючы, будзеце слухаць голас Мой і будзеце захоўваць запавет Мой, дык
вы будзеце Маёй уласнасьцю з усіх народаў, бо Мая ўся зямля.
6 І вы будзеце Маім валадарствам сьвятароў і народам сьвятым”. Гэта словы, якія ты прамовіш
да сыноў Ізраіля».
7 І прыйшоў Майсей, і паклікаў старшыняў народу, і прадставіў перад імі ўсе тыя словы, якія
загадаў яму ГОСПАД.
8 І адказаў увесь народ разам, і сказалі: «Усё, што сказаў ГОСПАД, зробім». І перадаў Майсей
ГОСПАДУ словы народу.
9 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вось, Я прыйду да цябе ў густым воблаку, каб чуў народ, як Я буду
гаварыць з табою, і каб таксама паверылі табе на вякі». І пераказаў Майсей ГОСПАДУ словы
народу.
10 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Ідзі да народу і асьвяці яго сёньня і заўтра; і няхай памыюць
адзеньне сваё,
11 і няхай будуць гатовыя да трэцяга дня; бо ў трэці дзень зыйдзе ГОСПАД перад вачыма ўсяго
народу на гару Сынай.
12 І правядзі мяжу народу наўкола, кажучы: “Сьцеражыцеся, каб узыходзіць на гару і
дакранацца да краю яе; кожны, хто дакранецца да гары, сьмерцю памрэ.
13 Няхай не дакранецца да яе рука, бо камянуючы, укамянуюць яго альбо прабіваючы,
праб’юць стралою; жывёла гэта ці чалавек, ня будуць жыць”. Калі працягла затрубіць рог,
могуць узыйсьці на гару».
14 І зыйшоў Майсей з гары да народу, і асьвяціў народ, і яны памылі адзеньне сваё.
15 І сказаў народу: «Будзьце гатовыя да трэцяга дня; не набліжайцеся да жанчыны».
16 І сталася ў трэці дзень, прыйшла раніца, і былі грымоты, і маланкі, і воблака цяжкае над
гарою, і гук трубы вельмі моцны; і задрыжаў увесь народ, які быў у табары.
17 І вывеў Майсей народ з табару насустрач Богу, і стаялі ля падножжа гары.
18 А гара Сынай уся дымілася, бо зыйшоў на яе ГОСПАД у агні; і ўзыходзіў ад яе дым, як дым з
печы, і ўся гара вельмі хісталася.
19 І быў гук трубы, і павялічваўся, і мацнеў. Майсей гаварыў, а Бог адказаваў яму голасам.
20 І зыйшоў ГОСПАД на гару Сынай, на вяршыню гары, і паклікаў ГОСПАД Майсея на вяршыню
гары, і ўзыйшоў Майсей.
21 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Зыйдзі, папярэдзь народ, каб ня рваўся да ГОСПАДА, каб убачыць,
і не загінула з яго мноства.
22 І таксама сьвятары, якія набліжаюцца да ГОСПАДА, няхай асьвяцяцца, каб ня выгубіў іх
ГОСПАД».
23 І сказаў Майсей ГОСПАДУ: «Ня можа народ узыйсьці на гару Сынай, бо Ты папярэдзіў нас,
кажучы: “Правядзі мяжу наўкола гары і асьвяці яе”».

24 І сказаў яму ГОСПАД: «Ідзі, зыйдзі і ўзыйдзі ты і Аарон з табою; а сьвятары і народ няхай ня
рвуцца ўзыйсьці да ГОСПАДА, каб Я ня выгубіў іх».
25 І зыйшоў Майсей да народу і сказаў ім.

Вых 20

1 І прамовіў Бог усе словы гэтыя, кажучы:
2 «Я — ГОСПАД, Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай, з дому няволі.
3 Ня будзеш мець іншых багоў перад абліччам Маім.
4 Не рабі сабе статуі і ніякай выявы таго, што на небе высока, і што на зямлі нізка, і што ў вадзе
ніжэй зямлі.
5 Ня будзеш пакланяцца ім і ня будзеш служыць ім, бо Я — ГОСПАД, Бог твой, Бог зайздросны,
Які карае за беззаконьні бацькоў дзяцей да трэцяга і аж да чацьвёртага [пакаленьня] тых, што
ненавідзяць Мяне,
6 і Які чыніць міласэрнасьць тысячам [пакаленьняў] тых, што любяць Мяне і захоўваюць
прыказаньні Мае.
7 Ня будзеш ужываць імя ГОСПАДА, Бога твайго, для марноты, бо ГОСПАД не пакіне без
пакараньня таго, хто ўжывае імя Ягонае для марноты.
8 Памятай дзень супачынку, каб сьвяціць яго.
9 Шэсьць дзён будзеш працаваць і будзеш рабіць усю работу тваю,
10 а дзень сёмы — супачынак для ГОСПАДА, Бога твайго. Ня будзеш рабіць ніякай работы ты і
сын твой, і дачка твая, слуга твой і служка твая, і жывёла твая, і прыхадзень твой, які ў брамах
тваіх,
11 бо за шэсьць дзён зрабіў ГОСПАД неба і зямлю, мора і ўсё, што ў іх, і спыніўся ў дзень сёмы.
Дзеля гэтага дабраславіў ГОСПАД дзень супачынку і асьвяціў яго.
12 Шануй бацьку твайго і маці тваю, каб працягнуліся дні твае на зямлі, якую ГОСПАД, Бог твой,
дае табе.
13 Ня будзеш забіваць [як забойца].
14 Ня будзеш чужаложыць.
15 Ня будзеш красьці.
16 Ня будзеш сьведчыць супраць бліжняга твайго сьведчаньнем фальшывым.
17 Ня будзеш жадаць дому бліжняга твайго; ня будзеш жадаць жонкі бліжняга твайго, ані
слугі ягонага, ані служкі ягонай, ані вала ягонага, ані асла ягонага, ані нічога, што ў бліжняга
твайго!»
18 І ўвесь народ глядзеў на грымоты і бліскавіцы, і гук трубы, і гару, якая дымілася; і, глядзеў
народ, і хістаўся, і стаяў здалёк.
19 І сказалі яны Майсею: «Ты прамаўляй да нас, і мы будзем слухаць; але няхай не прамаўляе
да нас Бог, каб нам не памерці».
20 І сказаў Майсей народу: «Ня бойцеся, бо дзеля таго, каб выпрабаваць вас, прыйшоў Бог, і
каб праз гэта страх Ягоны быў перад абліччам вашым, каб вы не грашылі».
21 І стаяў народ здалёк, а Майсей наблізіўся да імглы, туды, дзе Бог.
22 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Гэтак скажаш сынам Ізраіля: “Вы бачылі, што Я з неба прамаўляў
да вас.
23 Не рабіце побач са Мною багоў срэбных, і багоў залатых не рабіце сабе.
24 Ахвярнік з зямлі зрабі для Мяне, і ахвяруй на ім цэласпаленьні твае і мірныя ахвяры твае,
і авечак тваіх, і валоў тваіх. На кожнае месца, дзе Я ўзгадаю імя Маё, Я прыйду да цябе і
дабраслаўлю цябе.
25 А калі ахвярнік з камянёў зробіш для Мяне, не будуй яго з чэсаных [камянёў], бо калі
апрацуеш яго мячом сваім, апаганіш яго.
26 І ня будзеш узыходзіць па прыступках да ахвярніка Майго, каб не была адкрытая пры ім
голасьць твая”.

Вых 21

1 А вось суды, якія ты паставіш перад абліччам іхнім.
2 Калі купіш слугу Гебрая, шэсьць гадоў няхай ён служыць, а ў сёмы год няхай выйдзе на волю дарма.
3 Калі ён адзін прыйшоў, няхай адзін і выйдзе. А калі ён жанаты, няхай выйдзе з ім жонка ягоная.
4 Калі гаспадар ягоны даў яму жонку, і яна нарадзіла яму сыноў альбо дочак, дык жонка і дзеці ейныя застануцца ў гаспадара ейнага, а ён выйдзе адзін.
5 Але калі, кажучы, скажа слуга: “Люблю гаспадара майго, жонку маю і сыноў маіх; не пайду на волю”,
6 тады прывядзе яго гаспадар ягоны да Бога, і прывядзе яго да дзьвярэй або да вушака, і праколе яму гаспадар ягоны вуха ягонае шылам, і ён застанецца слугою ягоным на вякі.
7 І калі [нейкі] чалавек прадасьць дачку сваю як служку, няхай ня выйдзе яна, як выходзяць слугі.
8 Калі ліхая яна ў вачах гаспадара ейнага, які не заручыўся з ёю, няхай дазволіць выкупіць яе; а чужому народу ня мае ўлады яе прадаць, калі адмовіцца ад яе.
9 А калі для сына свайго ён заручыць яе, няхай робіць з ёю паводле права адносна дочак.
10 Калі іншую возьме сабе, няхай ня зьменшыць жыўленьня ейнага, адзеньня ейнага і супольнага ложку.
11 А калі ён гэтых трох рэчаў ня зробіць для яе, няхай яна адыйдзе дарма, бяз выкупу.
12 Той, хто ўдарыў чалавека, і [той] памёр, няхай сьмерцю памрэ.
13 Але калі ён ня меў намеру, але Бог выдаў [таго чалавека] ў руку ягоную, Я вызначу табе месца, куды ён мае ўцякаць.
14 А калі хто намысьліў супраць бліжняга свайго, каб забіць яго падступна, ад ахвярніка Майго возьмеш яго на сьмерць.
15 Той, хто ўдарыць бацьку свайго і маці сваю, няхай сьмерцю памрэ.
16 І той, хто ўкраў чалавека і прадаў яго, альбо ён знойдзены ў руцэ ягонай, няхай сьмерцю памрэ.
17 Той, хто праклінае бацьку свайго і маці сваю, няхай сьмерцю памрэ.
18 І калі людзі спрачаюцца, і ўдарыць чалавек бліжняга свайго камянём альбо кулаком, і той не памрэ, але зьляжа ў ложак,
19 дык калі ён устане і будзе выходзіць навонкі з кійком сваім, той, хто ўдарыў, будзе без пакараньня, толькі няхай аддасьць [яму] за перапынак [у працы] і, лечачы, няхай вылечыць яго.
20 А калі хто будзе біць слугу свайго альбо служку сваю кіем, і яны памруць пад рукою ягонай, няхай помстай адпомсьціцца яму.
21 Але калі яны дзень або два дні застануцца [жыць], ён ня мае быць помшчаны, бо гэта срэбра ягонае.
22 Калі будуць біцца мужчыны і ўдараць цяжарную жанчыну, і яна спароніць дзіця сваё, але ня будзе [іншай] шкоды, [вінаваты] будзе пакараны пакараньнем, якое наложыць на яго муж той жанчыны, і мае заплаціць пры судзьдзях.
23 А калі будзе шкода, аддасі душу за душу,
24 вока за вока, зуб за зуб, руку за руку, нагу за нагу,
25 апёк за апёк, рану за рану, сіняк за сіняк.
26 І калі хто ўдарыць у вока слугу свайго альбо ў вока служку сваю, і пашкодзіць яго, няхай адпусьціць іх на волю за вока.
27 А калі выб’е зуб слузе свайму або зуб служцы сваёй, няхай адпусьціць іх на волю за зуб.
28 І калі вол забадае мужчыну альбо жанчыну, і яны памруць, вала, камянуючы, трэба ўкаменаваць, і мяса ягонага ня есьці; а гаспадар вала невінаваты.
29 А калі вол бадлівы быў і ўчора, і пазаўчора, і папярэджвалі ўласьніка ягонага, і ён не пільнаваў яго, а ён забіў мужчыну альбо жанчыну, тады вол будзе ўкаменаваны і ўласьнік ягоны таксама памрэ.
30 Калі выкуп прызначаць яму, няхай дасьць выкуп за душу сваю, які прызначаны яму.

31 Калі сына забадае, або дачку забадае, паводле гэтага суду ўчыніць з ім.
32 Калі слугу альбо служку забадае вол, тады трыццаць сыкляў срэбра даць пану іхняму, а вол
будзе ўкаменаваны.
33 І калі хто адкрые яму, альбо калі выкапае яму і не накрые яе, і ўваліцца ў яе вол або асёл,
34 тады гаспадар ямы мае заплаціць, аддаць срэбра ўласьніку іхняму, а мёртвая [жывёла]
будзе ягонай.
35 А калі забадае вол [нейкага] чалавека вала бліжняга ягонага, і [той] памрэ, няхай прададуць
жывога вала і падзеляць папалам срэбра за яго, і таксама мёртвага няхай падзеляць папалам.
36 А калі вядома было, што вол бадлівы і ўчора, і пазаўчора, але ўласьнік ягоны не пільнаваў
яго, тады мае ён заплаціць вала за вала, а мёртвы будзе ягоны.

Вых 22

1 Калі хто ўкрадзе вала або ягня, і зарэжа яго або прадасьць яго, тады пяць валоў заплаціць за
вала і чатыры авечкі — за ягня.
2 Калі пры падкопаваньні будзе знойдзены злодзей, і будзе біты, і памрэ, тады няма [віны]
крыві за яго.
3 Калі ўзыйшло над ім сонца, будзе [віна] крыві за яго. Плацячы, мае заплаціць злодзей, а калі
ня мае чым [заплаціць], няхай прададуць яго за ўкрадзенае ім.
4 Калі шукаючы, знойдуць украдзенае ў руцэ ягонай ад вала аж да асла і да ягняці, і яны жывыя,
няхай заплаціць падвойна.
5 Калі хто спасьвіў поле або вінаграднік, і пусьціў статак свой, і пасьвіць на полі іншага, няхай
заплаціць найлепшым з поля свайго і найлепшым з вінаграднікі свайго.
6 Калі выйдзе агонь і ахопіць цярніну, і пажарэ снапы, або збожжа, або поле, тады плацячы,
заплаціць той, хто запаліў агонь.
7 Калі хто дасьць бліжняму свайму срэбра альбо рэчы на захаваньне, і яны будуць украдзеныя
з дому таго чалавека, калі будзе знойдзены злодзей, няхай заплаціць падвойна.
8 А калі ня будзе знойдзены злодзей, тады наблізіцца гаспадар дому да Бога, [і скажа,] што ня
выцягнуў рукі сваёй на ўласнасьць бліжняга свайго.
9 Пра ўсялякую рэч, [пра якую] няма згоды, пра вала, пра асла, пра авечку, пра плашч, пра
ўсялякую згубу, пра якую [нехта] скажа, што яна яго, справа абодвух мае прыйсьці да Бога.
Каго прызнае вінным Бог, той заплаціць бліжняму свайму падвойна.
10 Калі хто дасьць бліжняму свайму асла, альбо вала, альбо ягня, альбо якую іншую скаціну на
захаваньне, а яна здохне, або будзе скалечана, або ўзята ў палон, і ніхто гэтага ня бачыў,
11 тады прысяга перад ГОСПАДАМ няхай будзе між абодвума, што [той, што захоўваў,] ня
выцягнуў рукі сваёй на ўласнасьць бліжняга свайго; і прыйме гэтую [прысягу] гаспадар ейны,
і [той, што захоўваў,] ня будзе плаціць.
12 А калі, крадучы, украдуць у яго, тады заплаціць гаспадару ейнаму.
13 Калі разьдзіраючы, разьдзярэ яе [дзікі зьвер], тады як сьведчаньне прынясе разьдзёртае, і
ня будзе плаціць.
14 І калі хто пазычыць у бліжняга свайго [жывёлу], і яна будзе скалечана або здохне, а
гаспадара ейнага не было пры ёй, тады, плацячы, заплаціць [за яе].
15 А калі гаспадар ейны быў пры ёй, тады ня будзе плаціць. Калі яна нанята была [за грошы],
тады атрымае цану найму.
16 Калі хто зьвядзе дзяўчыну, якая не заручаная, і будзе ляжаць з ёю, мае заплаціць вена і ўзяць
яе сабе за жонку.
17 А калі бацька ейны, адмаўляючыся, адмовіцца выдаць яе за яго, няхай адважыць срэбра
паводле вена дзяўчыны.
18 Варажбіткі не пакінеш пры жыцьці.
19 Кожны, хто ляжа са скацінаю, няхай сьмерцю памрэ.
20 Той, хто складае ахвяры багам, апрача адзінага ГОСПАДА, будзе аддадзены закляцьцю.

21 А прыхадня ня будзеш крыўдзіць, і ня будзеш уціскаць яго, бо вы самі былі прыхаднямі ў
зямлі Эгіпецкай.
22 Ніякай удавы і сіраты ня будзеш прыгнятаць.
23 Калі ты, прыгнятаючы, будзеш прыгнятаць іх, тады яны крыкам будуць клікаць да Мяне, і Я
слухаючы, выслухаю крык іхні,
24 і ўзгарыцца гнеў Мой, і Я заб'ю вас мячом, і будуць жонкі вашыя ўдовамі, і дзеці вашыя —
сіротамі.
25 Калі пазычыш грошы [чалавеку] з народу Майго, беднаму, які ў цябе, ня будзеш для яго як
ліхвяр, не накладай на яго адсоткаў.
26 Калі, беручы ў заклад, возьмеш у заклад плашч бліжняга твайго, да заходу сонца зьвернеш
яму,
27 бо гэта — адзінае накрыцьцё ў яго, якім накрываецца ён, гэта — адзеньне для скуры ягонай.
На чым будзе ён спаць? І станецца, што ён будзе клікаць да Мяне, і Я пачую, бо Я — міласэрны.
28 Бога не праклінай, і начальніка ў народзе сваім не кляні.
29 Не марудзь [з ахвярамі] са шчодрасьці [току] твайго і тоўчні тваёй. Першароднага з сыноў
тваіх аддасі Мне.
30 Гэтаксама зробіш з валом тваім і з авечкаю тваёй. Сем дзён няхай яны будуць пры матцы
сваёй, а ў восьмы дзень аддасі іх Мне.
31 І вы будзеце сьвятымі людзьмі для Мяне; і мяса, разьдзёртага ў полі, ня ешце; сабакам
кідайце яго.

Вых 23

1 Ня будзеш разносіць весткі марнай, і не давай рукі тваёй бязбожніку, каб быць сьведкам
няправасьці.
2 Не станавіся з большасьцю, каб [рабіць] зло, і не адказвай у справе [судовай], прыхіляючыся
да большасьці, калі гэта перакручвае [праўду].
3 І ўбогаму не патурай у справе [судовай].
4 Калі сустрэнеш вала ворага твайго альбо асла ягонага, якія заблукалі, вяртаючы, зьвярні яго
яму.
5 Калі ўбачыш, што асёл ненавісьніка твайго ўпаў пад цяжарам сваім, не дазволь сабе пакінуць
яго, але застаючыся, застанься з ім.
6 Ня будзеш перакручваць суд беднага твайго ў [судовай] справе ягонай.
7 Ад слова фальшывага будзь далёка, і не забівай нявіннага і праведнага, бо Я не апраўдаю
бязбожніка.
8 Дароў не бяры, бо дар засьляпляе відушчых і перакручвае словы праведных.
9 І прыхадня не ўціскай, таму што вы ведаеце душу прыхадня, бо самі былі прыхаднямі ў зямлі
Эгіпецкай.
10 І шэсьць гадоў засявай зямлю тваю і зьбірай ураджай ейны,
11 а ў сёмы [год] запусьці яе і пакінь яе, і будуць жывіцца [з яе] бедныя народу твайго, а рэштаю
пасьля іх будуць жывіцца зьвяры палявыя. Так зробіш з вінаграднікам тваім і з аліўнікам
тваім.
12 Шэсьць дзён будзеш рабіць справы твае, а ў дзень сёмы супачынеш, каб спыніўся вол твой і
асёл твой, і адпачыў сын служкі тваёй і прыхадзень.
13 І ўсё, што Я сказаў вам, захоўвайце, і імя багоў іншых ня ўзгадвайце, няхай ня будзе чуваць
[яго] з вуснаў тваіх.
14 Тройчы ў год будзеш сьвяткаваць [сьвяты] Мае.
15 Сьвята Праснакоў будзеш захоўваць. Сем дзён будзеш есьці праснакі, як Я загадаў табе, у
вызначаным часе месяца Авіў, бо ў гэты [час] ты выйшаў з Эгіпту. І не зьяўляйцеся перад
аблічча Маё з пустымі [рукамі].
16 І Сьвята Жніва пяршынаў працы тваёй, якія ты сеяў на полі, і Сьвята Збору [ўраджаю] пры
заканчэньні году, калі зьбярэш працу тваю з поля.
17 Тройчы ў год мае зьяўляцца кожны мужчына твой перад аблічча Госпада ГОСПАДА.

18 Не ахвяроўвай над кіслым крыві ахвяры Маёй, і не пакідай на ноч тлушч сьвяточны да раніцы.
19 Першыя пяршыны зямлі тваёй прынось у дом ГОСПАДА, Бога твайго. Не вары казьляняці ў малацэ маці ягонай.
20 Вось, Я пасылаю перад табою анёла, каб ён захоўваў цябе ў дарозе і ўвёў цябе ў месца, якое Я падрыхтаваў.
21 Сьцеражыся перад абліччам ягоным і слухайся голасу ягонага; ня будзь горкім для яго, бо ён не даруе віны вашай, бо імя Маё ў ім.
22 Калі ты, слухаючы, будзеш слухаць голас ягоны і зробіш усё, што Я прамоўлю, Я буду ворагам ворагаў тваіх і буду ўціскаць тых, што ўціскаюць цябе.
23 Калі пойдзе анёл Мой перад табою, і прывядзе цябе да Амарэя, Хета, Пэрэзэя, Хананейца, Хівея і Евусэя, і Я выгублю іх,
24 не пакланяйся багам іхнім, і не служы ім, і не рабі паводле ўчынкаў іхніх, але руйнуючы, зруйнуй іх, і крышачы, скрышы слупы іхнія.
25 І служыце ГОСПАДУ, Богу вашаму, і Ён дабраславіць хлеб твой і ваду тваю; і Я аддалю хваробы спасярод цябе.
26 Ня будзе [той, якая] спароніць, і бясплоднай у зямлі тваёй; лік дзён тваіх Я напоўню.
27 Жах Мой Я пашлю перад табою і стрывожу кожны народ, да якога ты выйдзеш супраць яго, і павярну да цябе каркам усіх ворагаў тваіх.
28 І пашлю перад табою шаршанёў, і яны выганяць перад табою Хівея, Хананейца і Хета.
29 Ня выганю іх перад абліччам тваім за адзін год, каб зямля ня сталася пусткаю і не памножыліся супраць цябе зьвяры палявыя.
30 Памалу, памалу буду праганяць іх перад абліччам тваім, аж пакуль ты не памножышся і ня возьмеш у спадчыну зямлю гэтую.
31 І Я пастаўлю мяжу тваю ад Мора Чырвонага аж да Мора Філістынскага і ад пустыні аж да Ракі; бо дам у рукі вашыя жыхароў зямлі гэтай, і ты выганіш іх ад аблічча твайго.
32 Не заключай запавету ані з імі, ані з багамі іхнімі.
33 Няхай не жывуць яны ў зямлі тваёй, каб яны не ўвялі цябе ў грэх супраць Мяне; бо калі ты будзеш служыць багам іхнім, гэта станецца для цябе пасткаю».

Вых 24

1 І сказаў [Госпад] Майсею: «Узыйдзі да ГОСПАДА ты і Аарон, Надаў і Абігу, і семдзясят са старшыняў Ізраіля, і пакланіцеся здалёк.
2 І наблізіцца Майсей адзін да ГОСПАДА; а яны няхай не набліжаюцца, і народ няхай не ўзыходзіць з ім».
3 І прыйшоў Майсей, і пераказаў народу ўсе словы ГОСПАДА і ўсе суды [Ягоныя]; і адказаў увесь народ у адзін голас, і сказалі: «Усе словы, якія прамовіў ГОСПАД, выканаем!».
4 І напісаў Майсей усе словы ГОСПАДА, і ўстаў раніцаю, і збудаваў ахвярнік пад гарою і дванаццаць слупоў паводле дванаццаці плямёнаў Ізраіля.
5 І паслаў юнакоў з сыноў Ізраіля, і яны ўзьнесьлі цэласпаленьні і ахвяравалі валоў як ахвяры мірныя для ГОСПАДА.
6 І ўзяў Майсей палову крыві, і ўліў у чару, а паловаю крыві пакрапіў ахвярнік.
7 І ўзяў кнігу запавету, і прачытаў у вушы народу, і сказалі яны: «Усё, што сказаў ГОСПАД, зробім, і будзем слухаць».
8 І ўзяў Майсей кроў, і пакрапіў народ, і сказаў: «Вось, кроў запавету, які ГОСПАД заключыў з вамі, паводле ўсіх словаў гэтых».
9 І ўзыйшоў Майсей і Аарон, Надаў і Абігу і семдзясят старшыняў Ізраіля.
10 І бачылі Бога Ізраіля; і пад нагамі Ягонымі нібыта выраб з каменю шафіру і нібыта само неба ў яснасьці [сваёй].
11 І на выбраных сыноў Ізраіля Ён ня выцягнуў рукі Сваёй. І яны бачылі Бога, і елі, і пілі.

12 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Узыйдзі да Мяне на гару, і будзь там, і Я дам табе табліцы
каменныя, і закон, і прыказаньні, якія Я напісаў, каб навучыць іх».
13 І ўстаў Майсей і Егошуа, служыцель ягоны, і ўзыйшоў Майсей на гару Божую.
14 А старшыням сказаў: «Заставайцеся дзеля нас тут, пакуль мы вернемся да вас. І вось, Аарон
і Хур з вамі. Калі хто будзе мець [якую] справу, няхай наблізіцца да іх».
15 І ўзыйшоў Майсей на гару; і закрыла воблака гару.
16 І супачыла слава ГОСПАДА на гары Сынай; і закрывала воблака яе шэсьць дзён. І паклікаў
[Бог] у сёмы дзень Майсея з сярэдзіны воблака.
17 А выгляд славы ГОСПАДА быў як агонь палючы на вяршыні гары перад вачыма сыноў Ізраіля.
18 І ўвайшоў Майсей у сярэдзіну воблака, і ўзыйшоў на гару; і быў Майсей на гары сорак дзён
і сорак начэй.

Вых 25

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля, і няхай яны зьбяруць для Мяне дары. Ад кожнага чалавека, у якога
сэрца ягонае дабраахвотна [пажадае] даць, бярыце дар Мой.
3 І вось дары, якія вы будзеце зьбіраць ад іх: золата, срэбра і медзь,
4 і блакіт, і пурпур, і барвовы кармазын, і вісон, і казіную [поўсьць],
5 і скуры бараноў, фарбаваныя на чырвона, і скуры тахаш, і дрэва акацыі,
6 алей для асьвятленьня, пахошчы для алею памазаньня і для пахкага каджэньня,
7 камяні оніксу і камяні для аздабленьня эфоду і нагрудніку.
8 І няхай зробяць для Мяне сьвятыню, і Я буду жыць сярод іх.
9 Усё, як Я пакажу табе, паводле ўзору сялібы і паводле ўзору ўсяго начыньня яе, так і зрабіце.
10 І няхай зробяць каўчэг з дрэва акацыі; два з паловаю локці даўжыня яго, і паўтары локці
шырыня яго, і паўтары локці вышыня яго.
11 І пакрыеш яго шчырым золатам; знутры і звонку пакрыеш яго; і зробіш наверсе наўкола
вянок залаты.
12 І выльеш да яго чатыры колцы залатыя, і прыладзіш [іх] на чатырох кутах яго, два колцы на
адным баку яго, і два колцы на другім баку яго.
13 І зробіш насілы з дрэва акацыі, і пакрыеш іх золатам.
14 І ўложыш насілы ў колцы па баках каўчэгу, каб на іх насіць каўчэг.
15 У колцах каўчэгу маюць быць насілы, ня будуць іх вымаць адтуль.
16 І ўложыш у каўчэг Сьведчаньне, якое Я дам табе.
17 І зробіш накрыўку са шчырага золата, два локці з паловаю даўжыня яе, і паўтары локці
шырыня яе.
18 І зробіш двух херувімаў з золата, каванымі зробіш іх з абодвух бакоў накрыўкі.
19 І зробіш аднаго херувіма на тым баку, і аднаго херувіма на гэтым баку; разам з накрыўкай
зробіце херувімаў на абодвух баках яе.
20 І будуць херувімы, распусьціўшы крылы ўгару, захінаць крыламі сваімі накрыўку, а
абліччамі сваімі [будуць зьвернуты] адзін да аднаго; да накрыўкі будуць [зьвернутыя] абліччы
херувімаў.
21 І паложыш накрыўку на каўчэг зьверху, і ў каўчэг паложыш Сьведчаньне, якое Я дам табе.
22 І Я буду сустракацца з табою там, і гаварыць з табою з-над накрыўкі, паміж двух херувімаў,
якія над Каўчэгам Сьведчаньня, пра ўсё, што буду загадваць табе для сыноў Ізраіля.
23 І зробіш стол з дрэва акацыі, два локці даўжыня яго, локаць шырыня яго, і паўтары локці
вышыня яго.
24 І пакрыеш яго шчырым золатам, і зробіш яму вянок залаты наўкола.
25 І зробіш яму наўкола ліштву [шырынёю] ў далонь, і зробіш наўкола вянок залаты да ліштвы
ягонай.
26 І зробіш для яго чатыры колцы залатыя, і прыладзіш колцы да чатырох рагоў, якія пры
чатырох ножках ягоных.

27 Пры ліштвах маюць быць колцы, каб укладаць насілы і насіць стол.
28 І зробіш насілы з дрэва акацыі, і пакрыеш іх золатам, і будуць насіць на іх стол.
29 І зробіш да яго місы, і чашы, і збаны, і кубкі для складаньня ахвяраў вадкіх; са шчырага
золата зробіш іх.
30 І будзеш класьці на стол хлябы пакладныя перад абліччам Маім заўсёды.
31 І зробіш сьвечнік з золата шчырага, каваным будзе зроблены сьвечнік; падстава яго, і
сьцябло яго, чарачкі яго, яблыкі яго і кветкі яго маюць [выходзіць] з яго.
32 І шэсьць сьцяблінаў маюць выходзіць з бакоў яго: тры сьцябліны сьвечніка з аднаго боку
яго, і тры сьцябліны сьвечніка з другога боку яго.
33 Тры чарачкі, [падобныя] да мігдалу, з яблыкам і кветкаю, на адной сьцябліне, і тры чарачкі,
[падобныя] да мігдалу, на другой сьцябліне, з яблыкам і кветкаю. Гэтак на шасьці сьцяблінах,
што выходзяць са сьвечніка.
34 А на [камлі] сьвечніка маюць быць чатыры чарачкі, падобныя да мігдалу, з яблыкам і
кветкаю.
35 І яблык пад двума сьцяблінамі, [што выходзяць] з яго, і яблык пад двума сьцяблінамі,
[што выходзяць] з яго, і яблык пад двума сьцяблінамі, [што выходзяць] з яго, на ўсіх шасьці
сьцяблінах, што выходзяць са сьвечніка.
36 Яблыкі іхнія і сьцябліны іхнія будуць [выходзіць] з яго; ён увесь суцэльна [мае быць] каваны
са шчырага золата.
37 І зробіш сем лямпаў для яго, і будуць прыладжаны лямпы ягоныя, і будуць сьвяціць на
пярэдні бок яго.
38 І абцужкі да яго, і папяльнічкі да яго [зробіш] са шчырага золата.
39 З таленту золата шчырага няхай зробяць яго з усімі гэтымі прыладамі.
40 І глядзі, і зрабі паводле ўзору іхняга, які Я паказаў табе на гары.

Вых 26

1 А Сялібу зробіш з дзесяці палотнаў з кручанага вісону, з блакіту, з пурпуру і барвовага
кармазыну; і херувімаў зрабі на іх мастацкай работаю.
2 Даўжыня аднаго палатна — дваццаць восем локцяў, а шырыня аднаго палатна — чатыры
локці; мера адна для ўсіх палотнаў.
3 Пяць палотнаў няхай будуць злучаныя адно з адным, і пяць палотнаў злучаныя адно з адным.
4 І зробіш пяцелькі з блакіту на краі аднаго палатна на канцы для сьпінаньня; і гэтак зробіш
на краі апошняга палатна для сьпінаньня з іншага боку.
5 Пяцьдзясят пяцелек зробіш на адным палатне, і пяцьдзясят пяцелек зробіш на краі палатна
[ў месцы,] дзе маюць быць сьпятыя з іншага боку; пяцелькі будуць насупраць адна адной.
6 І зробіш пяцьдзясят гачыкаў залатых, і злучыш гачыкамі палотны адно з адным, і будзе
Сяліба адным [цэлым].
7 І зробіш палотны з казінае [поўсьці] для намёту Сялібы, адзінаццаць палотнаў зробіш іх.
8 Даўжыня аднаго палатна — трыццаць локцяў, а ў шырыню адно палатно — чатыры локці;
мера адна для адзінаццаці палотнаў.
9 І злучыш пяць палотнаў асобна і шэсьць палотнаў асобна. І зложыш удвая шостае палатно з
пярэдняга боку намёту.
10 І зробіш пяцьдзясят пяцелек на краі аднаго палатна на канцы для сьпінаньня, і пяцьдзясят
пяцелек на краі другога палатна для сьпінаньня з іншага боку.
11 І зробіш пяцьдзясят гачыкаў мядзяных, і ўложыш гачыкі ў пяцелькі, і злучыш намёт, і будзе
ён адным [цэлым].
12 А лішак, які застанецца ад палотнаў намёту, палова палатна, што засталася, няхай вісіць з
задняга боку Сялібы.
13 А локаць з аднаго і локаць з другога боку, якія застануцца ад даўжыні палотнаў намёту,
няхай вісяць па баках сялібы, з аднаго і з другога боку прыкрываючы яе.

14 І зробіш пакрыцьцё на намёт са скураў бараноў, фарбаваных на чырвона, і пакрыцьцё на
верх са скураў тахаш.
15 І зробіш з дрэва акацыі дошкі для Сялібы, якія будуць стаяць [проста].
16 Дзесяць локцяў даўжыня дошкі, і паўтары локці шырыня адной дошкі.
17 Два шыпы будуць у кожнай дошцы, асаджаныя адзін насупраць другога. Гэтак зробіш у-ва
ўсіх дошках Сялібы.
18 І зробіш дошкі для Сялібы — дваццаць дошак для паўднёвага боку, [што глядзіць] на
поўдзень.
19 І сорак срэбных падставак зробіш пад дваццаць дошак; дзьве падстаўкі пад адну дошку да
двух шыпоў ейных, і дзьве падстаўкі пад другую дошку да двух шыпоў ейных.
20 І да другога боку Сялібы на паўночны бок [зробіш] дваццаць дошак.
21 І сорак падставак для іх срэбных — дзьве падстаўкі пад адну дошку, і дзьве падстаўкі пад
другую дошку.
22 І для боку Сялібы, [што глядзіць] на захад, зробіш шэсьць дошак.
23 І дзьве дошкі зробіш для вуглоў Сялібы пры [заходнім] боку.
24 І будуць яны злучаныя ўнізе, і разам злучаныя ўгары адным колцам. Гэтак мае быць з імі
абедзьвума; для двух вуглоў яны будуць.
25 І [так] будзе восем дошак, і падставак іхніх срэбных шаснаццаць: дзьве падстаўкі пад адну
дошку, і дзьве падстаўкі пад другую дошку.
26 І зробіш жэрдкі з дрэва акацыі — пяць да дошак аднаго боку Сялібы,
27 і пяць жэрдак да дошак другога боку Сялібы, і пяць жэрдак да дошак задняга боку Сялібы,
[што глядзіць] на захад.
28 І жэрдка сярэдняя будзе праходзіць па сярэдзіне дошак ад аднаго канца да другога.
29 І дошкі пакрыеш золатам, і колцы на іх для ўкладаньня жэрдак зробіш залатыя, і пакрыеш
жэрдкі золатам.
30 І паставіш Сялібу паводле статуту ейнага, які Я паказаў табе на гары.
31 І зробіш заслону з блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону; мастацкай
работай маеш зрабіць яе разам з херувімамі.
32 І павесіш яе на чатырох слупах з акацыі, пакрытых золатам, з кручкамі залатымі, на чатырох
падстаўках срэбных.
33 І павесіш заслону на гачыках, і ўнясеш туды, унутр, за заслону Каўчэг Сьведчаньня; і будзе
аддзяляць заслона вам [месца] Сьвятое ад Сьвятога Сьвятых.
34 І паложыш накрыўку на Каўчэг Сьведчаньня ў Сьвятым Сьвятых.
35 І паставіш стол навонкі ад заслоны, і сьвечнік насупраць стала пры паўднёвым боку Сялібы;
а стол паставіш на паўночным баку.
36 І зробіш заслону на ўваходзе з блакіту, пурпуру, барвовавага кармазыну і кручанага вісону
гафтаванае работы.
37 І зробіш для заслоны пяць слупоў з акацыі, і пакрыеш іх золатам, і кручкі да іх залатыя; і
выльеш для іх пяць падставак мядзяных.

Вых 27

1 І зробіш ахвярнік з дрэва акацыі, пяць локцяў у даўжыню і пяць локцяў у шырыню,
чатырохкутні будзе ахвярнік, і тры локці ў вышыню.
2 І зробіш рогі ягоныя на чатырох вуглах ягоных, з яго будуць выходзіць рогі ягоныя, і пакрыеш
іх медзьдзю.
3 І зробіш да яго гаршчкі для [высыпаньня] попелу з яго, і лапаткі ягоныя, і місы ягоныя, і
відэльцы ягоныя, і кадзільніцы ягоныя. Усе начыньні зробіш з медзі.
4 І зробіш да яго крату, плеценай работы, мядзяную, і зробіш на пляцёнцы чатыры колцы
мядзяныя на чатырох вуглах яе.
5 І паложыш яе зьнізу пад вобад ахвярніка так, каб пляцёнка была да паловы ахвярніка.
6 І зробіш насілы для ахвярніка, насілы з дрэва акацыі, і пакрыеш іх медзьдзю.

7 І ўкладзеш насілы ягоныя ў колцы, і будуць насілы па абодвух баках ахвярніка для нашэньня яго.
8 Пустым унутры з дошак зробіш яго. Як паказана табе на гары, так няхай зробяць.
9 І зробіш панадворак Сялібы. З паўднёвага боку, [што глядзіць] на поўдзень, заслоны для панадворку з кручанага вісону, даўжынёй у сто локцяў з аднаго боку.
10 І слупоў да іх дваццаць, і падставак да іх дваццаць мядзяных; а кручкі на слупах і клямкі да іх — срэбныя.
11 Таксама з паўночнага боку ўздоўж [будуць] заслоны ў сто [локцяў] даўжыні; і слупоў да іх дваццаць, і падставак да іх дваццаць мядзяных; а кручкі на слупах і клямкі да іх — срэбныя.
12 А на шырыню панадворку з заходняга боку [будуць] заслоны ў пяцьдзясят локцяў; слупоў да іх дзесяць, і падставак да іх дзесяць.
13 І шырыня панадворку з пярэдняга боку, [што глядзіць] на ўсход, — пяцьдзясят локцяў.
14 Пятнаццаць локцяў — заслоны з [аднаго] краю; слупоў да іх тры, і падставак да іх тры.
15 І з другога краю — заслоны ў пятнаццаць [локцяў]; слупоў да іх тры, і падставак да іх тры.
16 А для брамы панадворку — заслона ў дваццаць локцяў з блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону, гафтаванае работы; слупоў да яе чатыры, і падставак да іх чатыры.
17 Усе слупы вакол панадворку злучаны срэбнымі клямкамі; кручкі ў іх — срэбныя, а падстаўкі да іх — мядзяныя.
18 Даўжыня панадворку — сто локцяў, а шырыня — пяцьдзясят і пяцьдзясят [паўсюль], а вышыня — пяць локцяў; [заслоны —] з кручанага вісону, а падстаўкі [слупоў] — мядзяныя.
19 Усе начыньні Сялібы для ўсялякага ўжываньня ў ёй і ўсе калкі ейныя, і ўсе калкі панадворку — мядзяныя.
20 І ты загадаеш сынам Ізраіля, і возьмуць табе алей з аліўкаў, чысты, выціснуты, для асьвятленьня, каб лямпы гарэлі заўсёды.
21 У Намёце Спатканьня навонкі ад заслоны, якая перад Сьведчаньнем, будуць запальваць іх Аарон і сыны ягоныя з вечара да раніцы перад абліччам ГОСПАДА. [Гэта] пастанова вечная для пакаленьняў іхніх ад сыноў Ізраіля.

Вых 28

1 І ты наблізь да сябе Аарона, брата твайго, і сыноў ягоных з ім спасярод сыноў Ізраіля, каб яны былі сьвятарамі Маімі: Аарона і Надава, Авігу, Элеазара і Ітамара, сыноў Аарона.
2 І зробіш сьвятыя адзеньні Аарону, брату твайму, дзеля славы і аздабленьня.
3 І скажаш усім мудрым сэрцам, якіх Я напоўніў духам мудрасьці, каб яны зрабілі Аарону адзеньні для асьвячэньня яго, каб ён быў сьвятаром Маім.
4 І вось адзеньні, якія яны маюць зрабіць: нагруднік і эфод, і верхняя шата, і хітон плецены, мітра і пояс. І зробяць сьвятыя адзеньні Аарону, брату твайму, і сынам ягоным, каб яны былі сьвятарамі Маімі.
5 Няхай яны возьмуць золата, і блакіт, і пурпур, і барвовы кармазын, і вісон,
6 і зробяць эфод з золата, блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону мастацкай работаю.
7 Два злучаныя нараменьнікі будзе ён мець на двух канцах сваіх, і так будзе злучаны.
8 І пас эфоду, які [падпярэзвае] яго, мае быць аднолькавае з ім работы, з золата, блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону.
9 І возьмеш два камяні оніксу, і выражаш на іх імёны сыноў Ізраіля.
10 Шэсьць імёнаў іхніх на адным камяні, і шэсьць імёнаў астатніх на другім камяні, паводле [парадку] нараджэньня іхняга.
11 Як разьбяр на камяні выразае пячатку, так ты выражаш на двух камянях імёны сыноў Ізраіля; асаджанымі ў залатыя аправы зробіш іх.
12 І паложыш абодва камяні гэтыя на нараменьнікі эфоду як камяні на ўспамін пра сыноў Ізраіля, і будзе насіць Аарон імёны іхнія перад абліччам ГОСПАДА на абодвух плячах сваіх як напамін.

13 І зробіш аправы з золата,
14 і два ланцужкі са шчырага золота, плеценымі зробіш іх, як зрабіў пас, і прымацуеш плеценыя
ланцужкі да аправаў.
15 І зробіш нагруднік судовы мастацкаю работаю, такою самаю работаю як эфод зробіш яго; з
золата, блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону зробіш яго.
16 Чатырохкутны ён мае быць і падвойны, у пядзю даўжыня ягоная і ў пядзю шырыня ягоная.
17 І напоўніш яго асаджанымі камянямі, чатырма шэрагамі камянёў. Рубін, тапаз і шмарагд
— гэта шэраг адзін.
18 А шэраг другі — гранат, шафір і дыямэнт.
19 А шэраг трэці — яхонт, агат і амэтыст.
20 А шэраг чацьвёрты — хрызаліт, онікс і ясьпіс. Яны маюць быць асаджаны ў золата ў асадах
сваіх.
21 І камяні будуць паводле імёнаў сыноў Ізраіля, дванаццаць паводле імёнаў іхніх, і на кожным
будзе выразанае як пячатка імя паводле [імёнаў] дванаццаці.
22 І зробіш для нагрудніку ланцужкі плеценыя вітою работаю, са шчырага золата.
23 І зробіш для нагрудніку два колцы залатыя, і прымацуеш два колцы да двух канцоў
нагрудніку.
24 І ўкладзеш два плеценыя залатыя ланцужкі ў абодва колцы на канцах нагрудніку.
25 А [іншыя] два канцы двух плеценых ланцужкоў прычэпіш да двух аправаў, і прымацуеш да
нараменьнікаў эфоду з пярэдняга боку яго.
26 І зробіш два колцы залатыя, і прымацуеш іх да двух канцоў нагрудніку на тым краі ягоным,
які пры ўнутраным боку эфоду.
27 І зробіш два колцы залатыя, і прымацуеш іх да двух нараменьнікаў эфоду зьнізу з пярэдняга
боку ягонага, каля злучэньня ягонага, над пасам эфоду.
28 І прымацуеш нагруднік з колцамі ягонымі колцамі ягонымі да колцаў эфоду шнурком з
блакіту, каб ён быў над пасам эфоду, і каб не ссоваўся нагруднік з эфоду.
29 І будзе насіць Аарон імёны сыноў Ізраіля на нагрудніку судовым на сэрцы сваім, калі будзе
ўваходзіць у сьвятыню, як успамін перад абліччам ГОСПАДА заўсёды.
30 І ўложыш у нагруднік судовы урым і тумім, і яны будуць каля сэрца Аарона, калі ён будзе
ўваходзіць у сьвятыню перад аблічча ГОСПАДА; і будзе Аарон насіць суд сыноў Ізраіля каля
сэрца свайго перад абліччам ГОСПАДА заўсёды.
31 І зробіш верхнюю шату да эфоду, усю з блакіту.
32 І будзе мець яна ў сярэдзіне адтуліну для галавы; абшыўка мае быць наўкола адтуліны,
ткацкай работы, як пры адтуліне панцыра, каб не разьдзёрлася.
33 І зробіш на прыполе ейным яблыкі гранатовыя з блакіту, пурпуру і барвовага кармазыну,
на прыполе ейным наўкола; і званочкі залатыя пасярод іх наўкола,
34 залаты званочак і гранатовы яблык, залаты званочак і гранатовы яблык, на прыполе верхняе
шаты наўкола.
35 І будзе [гэта] на Аароне ў часе служэньня [ягонага], і чутны будзе голас ягоны, калі ён будзе
ўваходзіць у сьвятыню перад аблічча ГОСПАДА, і калі будзе выходзіць, каб ён не памёр.
36 І зробіш дыядэму са шчырага золата, і выражаш на ёй, як выразаюць на пячатцы: “Сьвятыня
для ГОСПАДА!”,
37 і прымацуеш шнурком з блакіту, і будзе яна на мітры, на пярэднім баку мітры яна будзе.
38 І будзе яна на чале Аарона, і панясе Аарон беззаконьне, [якое будзе ў] асьвячоных рэчах,
якія пасьвяцілі сыны Ізраіля, у-ва ўсіх дарах, якія пасьвяцілі яны. І будзе яна на чале ягоным
заўсёды, каб былі [дары] даспадобы перад абліччам ГОСПАДА.
39 І вытчаш хітон з вісону, і зробіш мітру з вісону, і пояс зробіш гафтаванае работы.
40 І для сыноў Аарона зробіш хітоны, і зробіш для іх паясы, і турбаны зробіш для іх дзеля славы
і аздабленьня.
41 І апранеш у іх Аарона, брата свайго, і сыноў ягоных з ім, і памажаш іх, і напоўніш рукі іхнія,
і пасьвяціш іх, і яны будуць сьвятарамі Маімі.

42 І зробіш нагавіцы ільняныя, каб прыкрыць голасьць цела, ад сьцёгнаў да галёнкаў няхай
будуць.
43 І будуць яны на Аароне і на сынах ягоных, калі яны будуць уваходзіць у Намёт Спатканьня
або набліжацца да ахвярніка, каб служыць у сьвятыні, і [тады] яны не панясуць беззаконьня і
не памруць. [Гэта] пастанова вечная для яго і насеньня ягонага пасьля яго.

Вых 29

1 І вось тая рэч, якую зробіш для іх, каб пасьвяціць іх на сьвятароў для Мяне. Возьмеш аднаго
маладога бычка і двух бараноў без заганы,
2 і хлябы прэсныя, і печыва прэснае, рашчыненае на алеі, і аладкі прэсныя, памазаныя алеем;
з найлепшае мукі зробіш іх.
3 І паложыш іх у адзін кош, і прынясеш іх у кашы, і бычка, і двух бараноў.
4 І Аарона і сыноў ягоных прывядзеш да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і абмыеш іх у вадзе,
5 і возьмеш адзеньні, і апранеш на Аарона хітон і верхнюю шату эфоду, і эфод, і нагруднік, і
падпярэжаш яго поясам эфоду.
6 І ўскладзеш мітру на галаву ягоную, і прымацуеш дыядэму сьвятасьці на мітру.
7 І возьмеш алей памазаньня, і выльеш на галаву ягоную, і памажаш яго.
8 І сыноў ягоных прывядзеш, і апранеш на іх хітоны,
9 і падпярэжаш іх поясам, Аарона і сыноў ягоных, і адзенеш на іх турбаны, і будзе ім належаць
сьвятарства паводле пастановы вечнае, і напоўніш рукі Аарона і сыноў ягоных.
10 І прывядзеш бычка перад Намёт Спатканьня, і ўскладуць Аарон і сыны ягоныя рукі свае на
галаву бычка.
11 І зарэжаш бычка перад абліччам ГОСПАДА каля ўваходу ў Намёт Спатканьня.
12 І возьмеш кроў бычка, і памажаш рогі ахвярніка пальцам тваім, і ўсю кроў выльеш на
падставу ахвярніка.
13 І возьмеш увесь тлушч, які пакрывае нутро, і лой з вантробаў, і абедзьве ныркі, і тлушч, які
на іх, і спаліш на ахвярніку.
14 А мяса бычка, і скуру ягоную, і гной ягоны спаліш на агні па-за табарам. Гэта ахвяра за грэх.
15 І возьмеш аднаго з бараноў, і ўскладуць Аарон і сыны ягоныя рукі свае на галаву барана.
16 І зарэжаш барана, і возьмеш кроў ягоную, і пакропіш на ахвярнік наўкола.
17 І барана расьсячэш на кавалкі ягоныя, і вымыеш нутро ягонае і ногі ягоныя, і паложыш іх
на [расьсечаныя] кавалкі ягоныя і на галаву ягоную.
18 І спаліш усяго барана на ахвярніку. Гэта цэласпаленьне ГОСПАДУ, пах прыемны, ахвяра
агню для ГОСПАДА.
19 І возьмеш другога барана, і ўскладуць Аарон і сыны ягоныя рукі свае на галаву барана.
20 І зарэжаш барана, і возьмеш кроў ягоную, і памажаш верх правага вуха Аарона і верх правага
вуха сыноў ягоных, вялікі палец правай рукі іхняй, і вялікі палец правай нагі іхняй; і пакропіш
крывёю ахвярнік наўкола.
21 І возьмеш кроў, якая на ахвярніку, і алей памазаньня, і пакропіш Аарона і сыноў ягоных, і
адзеньне ягонае, і адзеньні сыноў ягоных з ім; і будзе асьвячоны ён і адзеньне ягонае, і сыны
ягоныя, і адзеньні сыноў ягоных з ім.
22 І возьмеш тлушч барана і хвост, і тлушч, які пакрывае нутро, і лой з вантробаў, і абедзьве
ныркі, і тлушч, які на іх, і правую лапатку, бо гэта баран пасьвячэньня,
23 і адзін бохан хлеба, і адно печыва хлеба, [зробленае] на алеі, і адну аладку з каша праснакоў,
які перад абліччам ГОСПАДА,
24 і паложыш усё [гэта] на далоні Аарона і на далоні сыноў ягоных, і будзеш патрэсваць іх як
ахвяру патрэсваньня перад абліччам ГОСПАДА.
25 І возьмеш іх з рук іхніх, і спаліш на ахвярніку як цэласпаленьне, пах прыемны перад
абліччам ГОСПАДА. Гэта ахвяра вагню для ГОСПАДА.
26 І возьмеш грудзіну барана пасьвячэньня, які быў для Аарона, і будзеш патрэсваць ёю як
ахвярай патрэсваньня перад абліччам ГОСПАДА, і гэта будзе частка твая.

27 І асьвяціш грудзіну патрасаную і лапатку ўзьнесеную, якія былі патрэсваныя і якія былі
ўзьнесеныя з барана пасьвячэньня, які быў для Аарона і які быў для сыноў ягоных.
28 І будуць яны для Аарона і сыноў ягоных паводле пастановы вечнай ад сыноў Ізраіля, бо
гэта ўзьнясеньне, і гэтае ўзьнясеньне мае быць ад сыноў Ізраіля з іхніх ахвяраў мірных,
узьнясеньне іхняе для ГОСПАДА.
29 І адзеньні сьвятыя, якія [належаць] Аарону, будуць [належаць] сынам ягоным пасьля яго,
каб у іх памазваць іх і напаўняць рукі іхнія.
30 Сем дзён мае апранацца ў іх сьвятар з сыноў ягоных, [які будзе] замест яго, які будзе
ўваходзіць у Намёт Спатканьня, каб служыць у сьвятыні.
31 І барана пасьвячэньня возьмеш, і зварыш мяса ягонае на месцы сьвятым.
32 І будзе есьці Аарон і сыны ягоныя мяса барана гэтага і хлеб, які ў кашы, каля ўваходу ў Намёт
Спатканьня.
33 І будуць яны есьці тое, што было перамаленьнем за іх, каб напоўніць рукі іхнія і асьвяціць
іх; а чужы ня будзе есьці гэта, бо гэта сьвятое.
34 І калі застанецца мяса пасьвячэньня і хлеб да раніцы, спаліш астачу на агні, нельга есьці
яго, бо гэта сьвятое.
35 І ўсё зробіш Аарону і сынам ягоным паводле таго, што Я загадаў табе: сем дзён будзеш
напаўняць рукі іхнія.
36 І бычка як ахвяру за грэх будзеш складаць кожны дзень дзеля перамольваньня, і ачысьціш
ахвярнік ад грэху, учыніўшы перамольваньне за яго, і памажаш яго, і асьвяціш яго.
37 Сем дзён будзеш зьдзяйсьняць перамольваньне за ахвярнік і будзеш асьвячаць яго, і будзе
ахвярнік сьвятое сьвятых; усё, што дакранецца да ахвярніка, будзе сьвятым.
38 Вось што будзеш складаць [у ахвяру] на ахвярніку: двух ягнятаў аднагодак кожны дзень
заўсёды.
39 Адно ягня складзеш [у ахвяру] раніцай, а другое ягня складзеш [у ахвяру] вечарам.
40 І на адно ягня [возьмеш] дзясятую частку [эфы] найлепшае мукі, зьмяшанай з алеем
выціснутым, якога чвэрць гіну, і на ўзьліваньне — чвэрць гіну віна.
41 А другое ягня складзеш [у ахвяру] ўвечары, падобна як ахвяраваньне раніцаю і ўзьліваньне
пры ёй складзеш яго на пах прыемны, на ахвяру агню для ГОСПАДА.
42 [Гэта] цэласпаленьне, [якое будзе] заўсёды ў пакаленьнях вашых перад уваходам у Намёт
Спатканьня перад абліччам ГОСПАДА, дзе буду сустракацца з вамі, каб размаўляць там з
табою.
43 І буду сустракацца там з сынамі Ізраіля, і будзе асьвячонае [тое месца] славаю Маёю.
44 І Я асьвячу Намёт Спатканьня і ахвярнік; і Аарона і сыноў ягоных асьвячу, каб яны былі
сьвятарамі Маімі.
45 І буду жыць сярод сыноў Ізраіля, і буду ім Богам.
46 І пазнаюць, што Я — ГОСПАД, Бог іхні, Які вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, каб Мне жыць сярод
іх. Я — ГОСПАД, Бог іхні.

Вых 30

1 І зробіш ахвярнік для каджэньня кадзіла; з дрэва акацыі зробіш яго.
2 Локаць — даўжыня ягоная, і локаць — шырыня ягоная; ён мае быць чатырохкутны; і два локці
— вышыня ягоная; з яго маюць выходзіць рогі.
3 І пакрыеш яго шчырым золатам, верх ягоны і сьценкі ягоныя наўкола, і рогі ягоныя; і зробіш
да яго залаты вянок наўкола.
4 І два колцы залатыя зробіш да яго, пад вянком ягоным, на двух вуглах ягоных; зробіш іх з
двух бакоў ягоных; і будуць яны месцам для насілаў, каб насіць яго на іх.
5 І зробіш насілы з дрэва акацыі, і пакрыеш іх золатам.
6 І паставіш яго перад заслонаю, якая перад Каўчэгам Сьведчаньня, перад накрыўкаю, якая над
Сьведчаньнем, дзе Я буду сустракацца з табою.
7 І будзе паліць на ім Аарон пахкае кадзіла кожную раніцу. Калі ён будзе папраўляць лямпы,
будзе паліць [кадзіла].

8 І калі Аарон будзе запальваць лямпы ўвечары, ён будзе паліць [кадзіла]. Гэта заўсёднае
каджэньне перад ГОСПАДАМ у пакаленьнях вашых.
9 Не паліце на ім ніякага кадзіла чужога, ані цэласпаленьня, ані дару; і ўзьліваньня не
ўзьлівайце на яго.
10 І будзе спраўляць Аарон перамольваньне над рогамі яго раз у год. Крывёю ахвяры за грэх
раз у год перамольваньнем будзе перамольваць на ім за пакаленьні вашыя. Гэта сьвятое
сьвятых для ГОСПАДА».
11 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
12 «Калі будзеш зьбіраць [падатак] з галавы ў сыноў Ізраіля пры лічэньні іх, няхай дасьць
[кожны] мужчына выкуп душы сваёй ГОСПАДУ пры лічэньні іх, і ня будзе між імі плягі, калі
будуць лічыць іх.
13 Гэта павінны даць усе, хто падлягае лічэньню — палову сыкля, паводле сыкля сьвятыні, у
якім дваццаць гер у сыклі; палова сыкля — дар для ГОСПАДА.
14 Усе, хто падлягае лічэньню, ад дваццаці гадоў і вышэй, маюць даць дар ГОСПАДУ.
15 Багаты ня будзе павялічваць, і бедны ня будзе памяншаць ад паловы сыкля, што маюць
даваць як дар ГОСПАДУ дзеля перамольваньня за душы вашыя.
16 І возьмеш срэбра перамольваньня ад сыноў Ізраіля, і дасі яго на служэньне ў Намёце
Спатканьня; і будзе гэта сынам Ізраіля на памяць перад абліччам ГОСПАДА дзеля
перамольваньня за душы вашыя».
17 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
18 «І зробіш мыцельнік мядзяны і падставу мядзяную да ўмываньня, і паставіш яго паміж
Намётам Спатканьня і ахвярнікам, і нальеш у яго вады.
19 І будуць Аарон і сыны ягоныя мыць у ім рукі свае і ногі свае.
20 Калі яны будуць уваходзіць у Намёт Спатканьня, няхай яны абмыюцца вадою, і яны
не памруць; таксама калі яны будуць набліжацца да ахвярніка дзеля служэньня, дзеля
ахвяраваньня вогненнага для ГОСПАДА,
21 і будуць яны абмываць рукі свае і ногі свае, і не памруць. І будзе гэта ім пастанова вечная,
яму і насеньню ягонаму ў пакаленьнях іхніх».
22 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
23 «І ты вазьмі сабе найлепшых пахошчаў: міра найчысьцейшага пяцьсот [сыкляў],
цынамону пахкага палову гэтага, дзьвесьце пяцьдзясят [сыкляў], трысьнёгу пахкага дзьвесьце
пяцьдзясят [сыкляў],
24 і касіі пяцьсот [сыкляў], паводле сыклю сьвятыні, і алею аліўкавага гін.
25 І зробіш з гэтага алей сьвятога памазаньня, масьць мяшаную работы мяшальніка масьцяў.
Алей сьвятога памазаньня гэта будзе.
26 І памажаш ім Намёт Спатканьня, і Каўчэг Сьведчаньня,
27 і стол, і ўсе начыньні ягоныя, і сьвечнік, і ўсе начыньні ягоныя, і ахвярнік каджэньня,
28 і ахвярнік цэласпаленьня, і ўсе начыньні ягоныя, і мыцельнік, і падставу ягоную.
29 І асьвяціш іх, і будуць яны сьвятое сьвятых; усё, што дакранецца да іх, будзе сьвятым.
30 І Аарона і сыноў ягоных памажаш і асьвяціш іх, каб былі сьвятарамі Маімі.
31 А да сыноў Ізраіля прамоў, кажучы: “Гэта будзе для Мяне алей сьвятога памазаньня ў
пакаленьнях вашых.
32 На цела чалавека ня будуць узьліваць яго, і паводле складу ягонага не рабіце падобнага да
яго. Ён — сьвяты, сьвятым мае быць для вас.
33 Чалавек, які [зробіць] работай мяшальніка масьцяў [алей], падобны да яго, і які памажа ім
чужынца, будзе выгублены з народу свайго”».
34 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вазьмі сабе пахошчы: бальзам, і жывіцу, і галбан пахкі, і ладан
чысты, кожнае ў роўнай частцы.
35 І зробіш з гэтага кадзіла мяшанае работай мяшальніка масьцяў, пасоленае, чыстае, сьвятое.
36 І стаўчэш яго дробна, і паложыш перад Сьведчаньнем у Намёце Спатканьня, дзе Я буду
сустракацца з табою. Гэта сьвятое сьвятых будзе для вас.

37 І кадзіла, якое зробіш, падобнага да яго паводле складу ягонага не рабіце сабе. Сьвятое яно
будзе ў цябе для ГОСПАДА.
38 Чалавек, які зробіць падобнае да яго, каб адчуваць пах ягоны, будзе выгублены з народу
свайго».

Вых 31

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Глядзі, Я паклікаў па іменьні Бэцалеэля, сына Урыя, сына Хура, з калена Юды.
3 І Я напоўніў яго Духам Божым, мудрасьцю, разумнасьцю, веданьнем і [ўменьнем] да
ўсялякай працы,
4 мастацкімі здольнасьцямі рабіць з золата, срэбра і медзі,
5 і абрабляць камяні для асаджэньня [іх], і абрабляць дрэва, каб рабіць [з ім] усялякую працу.
6 І вось, Я даў яму Агаліява, сына Ахісамаха, з калена Дана, і ў сэрца кожнага мудрага сэрцам
Я даў мудрасьць, і яны зробяць усё, што Я загадаў табе:
7 Намёт Спатканьня і Каўчэг Сьведчаньня, і накрыўку, якая на ім, і ўсе начыньні Намёту,
8 і стол, і начыньні ягоныя, і сьвечнік чысты, і ўсе начыньні, і ахвярнік каджэньня,
9 і ахвярнік цэласпаленьня, і ўсе начыньні ягоныя, і мыцельнік, і падставу ягоную,
10 і адзеньні службовыя, і адзеньні сьвятыя для Аарона сьвятара, і адзеньні сыноў ягоных да
сьвятарства,
11 і алей памазаньня, і кадзіла пахкае для сьвятыні. Усё так, як Я загадаў табе, яны зробяць».
12 І сказаў ГОСПАД Майсею, кажучы:
13 «І ты прамовіш да сыноў Ізраіля, кажучы: “Толькі захоўвайце супачынкі Мае, бо гэта знак
паміж Мною і вамі ў пакаленьнях вашых, каб вы пазналі, што Я — ГОСПАД, Які асьвячае вас.
14 І захоўвайце суботу, бо яна — сьвятая для вас. Хто апаганіць яе, сьмерцю памрэ. Хто будзе
ў яе рабіць работу, будзе выгублена душа тая спаміж народу свайго.
15 Шэсьць дзён будуць рабіць работу, а дзень сёмы — субота супачынку, сьвятая для ГОСПАДА.
Кожны, хто будзе рабіць работу ў дзень супачынку, сьмерцю памрэ.
16 І будуць захоўваць сыны Ізраіля суботу, каб рабіць супачынак у пакаленьнях сваіх. [Гэта]
запавет вечны.
17 Паміж Мною і сынамі Ізраіля гэта знак на вякі; бо за шэсьць дзён зрабіў ГОСПАД неба і зямлю,
а ў сёмы дзень супачыў і адпачыў”».
18 І даў Бог Майсею, калі скончыў прамаўляць да яго на гары Сынай, дзьве табліцы
сьведчаньня, табліцы каменныя, запісаныя пальцам Божым.

Вых 32

1 І бачыў народ, што Майсей затрымліваецца, каб зыйсьці з гары, і сабраўся народ перад
Ааронам, і сказалі яму: «Устань, зрабі нам багоў, якія будуць ісьці перад намі, бо з гэтым
Майсеем, гэтым чалавекам, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай, ня ведаем, што сталася з ім».
2 І сказаў ім Аарон: «Зьніміце завушніцы залатыя, якія ў вушах жонак вашых, сыноў вашых і
дочак вашых, і прынясіце да мяне».
3 І зьняў увесь народ завушніцы залатыя, якія ў вушах іхніх, і прынесьлі да Аарона.
4 І ён узяў [гэта] з рук іхніх, і ўфармаваў яго разцом, і зрабіў з яго цяля літое. І сказалі яны:
«Вось бог твой, Ізраілю, які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай».
5 І ўбачыў Аарон, і збудаваў перад ім ахвярнік, і ўсклікнуў Аарон, і сказаў: «Сьвята для
ГОСПАДА заўтра».
6 І яны ўсталі рана назаўтра, і ахвяроўвалі цэласпаленьні, і прынесьлі ахвяры мірныя; і сеў
народ есьці і піць, і ўсталі гуляць.
7 І прамовіў ГОСПАД да Майсея: «Ідзі, зыйдзі, бо сапсаваўся народ твой, які ты вывеў з зямлі
Эгіпецкай.
8 Хутка зьвярнулі яны са шляху, які Я загадаў ім, зрабілі сабе цяля літое, і пакланіліся яму, і
ахвяроўвалі яму, і сказалі: “Вось бог твой, Ізраілю, які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай”».
9 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Я бачыў народ гэты, і вось, ён — народ з цьвёрдым каркам.

10 І цяпер пакінь Мяне, і ўзгарыцца гнеў Мой на іх, і Я выгублю іх, і зраблю з цябе народ вялікі».
11 І маліў Майсей аблічча ГОСПАДА, Бога свайго, і сказаў: «Дзеля чаго, ГОСПАДЗЕ, палае гнеў
Твой на народ Твой, які Ты вывеў з зямлі Эгіпецкай сілаю вялікай і рукою моцнай?
12 Навошта маюць казаць Эгіпцяне, кажучы: “На ліха вывеў іх, каб забіць іх у гарах і вынішчыць
іх з аблічча зямлі”. Адвярніся ад ярасьці гневу Твайго і пашкадуй [рабіць] ліха народу Твайму.
13 Узгадай Абрагама, Ісаака і Ізраіля, слугаў Тваіх, якім Ты прысягаў на Сябе Самога, і прамовіў
да іх: “Памножу насеньне вашае, як зоркі ў небе, і ўсю зямлю гэтую, пра якую Я сказаў, дам
насенню вашаму, і яны ўспадкаемяць яе на вякі”».
14 І пашкадаваў ГОСПАД рабіць ліха, пра якое Ён казаў, што ўчыніць яго народу Свайму.
15 І павярнуўся, і зыйшоў Майсей з гары; і дзьве табліцы Сьведчаньня [былі] ў руцэ ягонай,
табліцы, на якіх было напісана з абодвух бакоў, на адным і на другім баку было напісана на іх.
16 І табліцы былі творам Бога, і пісьмо было пісьмом Божым, высечаным на табліцах.
17 І пачуў Егошуа голас народу, які ўсклікаў, і сказаў Майсею: «Голас вайны ў табары».
18 І сказаў [Майсей]: «Гэта ані голас крыку перамогі, ані голас крыку паразы, але я чую голас
пяяньня».
19 І сталася, калі ён наблізіўся да табару і ўбачыў цяля і танцы, узгарэўся гнеў Майсея, і ён
кінуў з рук сваіх табліцы, і разьбіў іх пад гарою.
20 І ўзяў ён цяля, якое яны зрабілі, і спаліў яго ў агні, і сьцёр на попел, і рассыпаў на абліччы
вады, і даў яго піць сынам Ізраіля.
21 І сказаў Майсей Аарону: «Што зрабіў табе народ гэты, што ты ўвёў яго ў грэх вялікі?»
22 І сказаў Аарон: «Няхай не ўзгараецца гнеў пана майго; ты ведаеш народ гэты, што ён поўны
ліха.
23 І яны сказалі мне: “Зрабі нам багоў, якія будуць ісьці перад намі, бо з гэтым Майсеем,
чалавекам, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай, ня ведаем, што сталася з ім”.
24 І я сказаў ім: “Хто мае золата, няхай здыме яго”. І яны далі мне, я кінуў яго ў агонь, і выйшла
гэта цяля».
25 І ўбачыў Майсей народ, што ён неакелзаны, бо Аарон раскелзаў яго на паганьбеньне перад
ворагамі ягонымі.
26 І стаў Майсей у браме табару, і сказаў: «Хто за ГОСПАДА — да мяне!» І сабраліся да яго ўсе
сыны Левія.
27 І ён сказаў ім: «Гэтак кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Падперажыце кожны меч свой да сьцягна
свайго, перайдзіце і зьвярніцеся ад брамы да брамы праз табар, і забівайце кожны брата
свайго, кожны сябра свайго, кожны бліжняга свайго”».
28 І зрабілі сыны Левія паводле слова Майсея, і палегла з народу ў той дзень каля трох тысячаў
чалавек.
29 І сказаў Майсей: «Напоўніце рукі свае сёньня для ГОСПАДА, бо кожны быў супраць сына
свайго і супраць брата свайго, каб Ён даў вам сёньня дабраслаўленьне».
30 І сталася назаўтра, і сказаў Майсей народу: «Вы саграшылі грахом вялікім, і цяпер я ўзыйду
да ГОСПАДА, можа, змагу перамаліць Яго за грэх ваш».
31 І вярнуўся Майсей да ГОСПАДА, і сказаў: «Прашу, саграшыў народ гэты грэхам вялікім, і
зрабілі сабе багоў залатых.
32 І цяпер, ці можаш дараваць ім грэх іхні? А калі не, вытры мяне, прашу, з кнігі Тваёй, якую
Ты напісаў».
33 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Таго, хто саграшыў перада Мною, Я вытру з кнігі Маёй.
34 І цяпер ідзі, вядзі народ гэты, куды Я казаў табе. Вось, анёл Мой пойдзе перад табою, і ў
дзень наведваньня Майго Я наведаю іх за грэх іхні».
35 І ўдарыў ГОСПАД народ за тое, што зрабілі цяля, якога зрабіў Аарон.

Вых 33

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея: «Ідзі, узыйдзі адгэтуль ты і народ, які ты вывеў з зямлі
Эгіпецкай, у зямлю, пра якую Я прысягаў Абрагаму, Ісааку і Якубу, кажучы: “Насеньню твайму
дам яе”.

2 І Я пашлю перад абліччам тваім анёла, і выганю Хананейца, Амарэя, Хета, Пэрэзэя, Хівея і
Евусэя.
3 І ўвядзе ён вас у зямлю, дзе цячэ малако і мёд, бо Сам Я не пайду сярод цябе, бо ты — народ
з цьвёрдым каркам, каб Я не выгубіў вас у дарозе».
4 І пачуў народ ліхое слова гэтае, і загаласіў, і не ўзлажыў ніхто аздобаў сваіх на сябе.
5 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Скажы сынам Ізраіля: “Ты — народ з цьвёрдым каркам. Калі Я
адну хвіліну буду ісьці сярод цябе, Я выгублю цябе. А цяпер здымі з сябе аздобы свае, і Я буду
ведаць, што маю рабіць з табою”».
6 І зьнялі з сябе сыны Ізраіля аздобы свае каля гары Харэў.
7 І Майсей узяў намёт, і паставіў яго па-за табарам, воддаль ад табару, і назваў яго Намётам
Спатканьня; і было, што кожны, хто шукаў ГОСПАДА, выходзіў да Намёту Спатканьня, які [быў]
па-за табарам.
8 І было, калі Майсей выходзіў да Намёту, уставаў увесь народ, і стаяў кожны каля ўваходу ў
намёт свой, і глядзеў на Майсея, аж пакуль ён не ўваходзіў у Намёт.
9 І было, калі Майсей уваходзіў у Намёт, зыходзіў слуп воблачны і станавіўся каля ўваходу ў
Намёт, і [Бог] гаварыў з Майсеем.
10 І бачыў увесь народ слуп воблачны, які стаяў каля ўваходу ў Намёт; і ўставаў увесь народ, і
кланяўся кожны каля ўваходу ў намёт свой.
11 І гаварыў ГОСПАД з Майсеем абліччам да аблічча, як гаворыць чалавек з сябрам сваім; і
ён вяртаўся ў табар; а служыцель ягоны Егошуа, сын Нуна, юнак, не адыходзіў з сярэдзіны
Намёту.
12 І сказаў Майсей ГОСПАДУ: «Глядзі, Ты кажаш мне: “Узьвядзі народ гэты”, а Ты не паведаміў
мне, каго пашлеш са мною. І Ты сказаў: “Я ведаю цябе на імя”, і таксама: “Ты знайшоў ласку
ў вачах Маіх”.
13 І цяпер, калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх, дай мне спазнаць, прашу, шлях Твой, і я спазнаю
Цябе, каб знайсьці ласку ў вачах Тваіх. І Ты паглядзі, што гэты народ — народ Твой».
14 І сказаў [Госпад]: «Аблічча Маё пойдзе [перад табою], і Я супакою цябе».
15 І сказаў [Майсей] Яму: «Калі ня пойдзе аблічча Тваё, не выводзь нас адгэтуль.
16 Бо з чаго я спазнаю, што знайшоў ласку ў вачах Тваіх, я і народ Твой? Ці не з таго, што Ты
пойдзеш з намі? І будзем аддзеленыя я і народ Твой ад усіх народаў, якія на абліччы зямлі».
17 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Таксама паводле гэтага слова, якое ты прамовіў, Я зраблю, бо ты
знайшоў ласку ў вачах Маіх, і Я ведаю цябе на імя».
18 І сказаў [Майсей]: «Пакажы мне, прашу, славу Тваю».
19 І сказаў [Госпад]: «Я правяду перад абліччам тваім усю добрасьць Сваю, і назаву імя
ГОСПАДА перад табою, і буду літасьцівы для таго, для каго буду літасьцівы, і буду міласьцівы
для таго, для каго буду міласьцівы».
20 І сказаў [Госпад]: «Ня зможаш паглядзець на аблічча Маё, бо ня можа глядзець на Мяне
чалавек і застацца жывы».
21 І сказаў ГОСПАД: «Вось месца пры Мне, і ты стань на гэтай скале.
22 І станецца, калі будзе ісьці слава Мая, Я пастаўлю цябе ў шчыліне скалы, і захіну цябе
далоньню Маёй, пакуль не прайду.
23 І калі Я прыбяру далонь Маю, ты ўбачыш Мяне ззаду, але аблічча Маё ня будзе відаць».

Вых 34

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вычашы сабе дзьве табліцы каменныя, падобныя да першых, і Я
напішу на тых табліцах словы, якія былі на першых табліцах, якія ты разьбіў.
2 І будзь гатовы на раніцу, і ўзыйдзеш раніцаю на гару Сынай, і станеш перада Мною там на
вяршыні гары.
3 І ніхто няхай ня ўзыйдзе з табою, і таксама ніхто няхай не паказваецца на ўсёй гары; таксама
авечкі і валы ня будуць пасьвіцца насупраць гары гэтай».

4 І вычасаў Майсей дзьве табліцы каменныя, падобныя да першых, і ўстаў рана раніцай, і
ўзыйшоў на гару Сынай, як загадаў яму ГОСПАД; і ўзяў у рукі свае дзьве табліцы каменныя.
5 І зыйшоў ГОСПАД у воблаку, і стаў там пры ім, і ён назваў імя ГОСПАДА.
6 І прайшоў ГОСПАД перад абліччам ягоным, і абвясьціў: «ГОСПАД, ГОСПАД, Бог спагадлівы і
літасьцівы, павольны да гневу і багаты на міласэрнасьць і праўду,
7 Які захоўвае міласэрнасьць тысячам, Які даруе беззаконьне, і правіну, і грэх, але не пакідае
без пакараньня, Які наведвае за беззаконьне бацькоў сыноў і сыноў сыноў да трэцяга і
чацьвёртага пакаленьня».
8 І пасьпяшаўся Майсей, і схіліўся да зямлі, і пакланіўся,
9 і сказаў: «Калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх, Госпадзе, няхай ідзе Госпад сярод нас, бо народ
гэты — [народ] з цьвёрдым каркам, і прабач беззаконьні нашыя і грахі нашыя, і мей нас за
спадчыну Тваю».
10 І сказаў [Госпад]: «Вось, Я заключу запавет, перад усім народам тваім учыню цуды, якія
не былі твораныя на ўсёй зямлі і ні ў якім з народаў; і ўбачыць увесь народ, сярод якога ты,
учыненае ГОСПАДАМ, бо страшнае будзе тое, што Я ўчыню праз цябе.
11 Захавай тое, што Я загадваю табе сёньня. Вось, Я выганю перад абліччам тваім Амарэя,
Хананейца, Хета, Пэрэзэя, Хівея і Евусэя.
12 Сьцеражыся, не заключай запавет з жыхарамі той зямлі, у якую ты ўвойдзеш, каб ён ня
стаўся пасткаю сярод цябе.
13 Але ахвярнікі іхнія скрышыце, і слупы іхнія паламіце, і гаі іхнія высячыце,
14 бо ня будзеш пакланяцца богу іншаму, акрамя ГОСПАДА; Зайздросны імя Ягонае, Ён — Бог
зайздросны.
15 Не заключай запавет з жыхарамі той зямлі, бо яны будуць распусьнічаць з багамі сваімі, і
будуць складаць ахвяры багам сваім, і паклічуць цябе, і ты будзеш есьці ахвяры іхнія,
16 і возьмеш дочак іхніх сынам тваім, і яны будуць распусьнічаць з багамі сваімі, і будуць
распусьнічаць сыны твае з багамі іхнімі.
17 Багоў літых не рабіце сабе.
18 Сьвята Праснакоў захоўвай. Сем дзён будзеш есьці праснакі, як Я загадаў табе, у
вызначаным часе месяца Авіў, бо ў месяцы Авіў ты выйшаў з Эгіпту.
19 Усё, што адкрывае ўлоньне, Мне [належыць], і ўсё першароднае мужчынскага роду са статку
твайго, вол і авечка.
20 Асла, які адкрывае [ўлоньне], выкупіш баранчыкам, а калі ня выкупіш, зламі карак ягоны.
Усіх першародных сыноў тваіх выкупіш, і няхай ня бачаць аблічча Майго з пустымі [рукамі].
21 Шэсьць дзён працуй, а ў сёмы дзень супачынь; і ў [часе] араньня, і ў [часе] жніва супачынь.
22 І Сьвята Тыдняў зробіш сабе, і [Сьвята] Пяршынаў жніва пшаніцы, і Сьвята Збору [ўраджаю]
ў канцы году.
23 Тройчы ў год мае зьяўляцца кожны мужчына твой перад аблічча Госпада ГОСПАДА, Бога
Ізраіля.
24 Бо Я выганю народы перад абліччам тваім, і пашыру межы твае, і ніхто не пажадае зямлі
тваёй, калі ты ўзыйдзеш, каб зьявіцца перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, тройчы ў год.
25 Не ахвяроўвай над кіслым крыві ахвяры Маёй, і не пакідай на ноч да раніцы ахвяру Сьвята
Пасхі.
26 Першыя пяршыны зямлі тваёй прынось у дом ГОСПАДА, Бога твайго. Не вары казляняці ў
малацэ маці ягонай».
27 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Напішы сабе словы гэтыя, бо паводле гэтых словаў Я заключыў
запавет з табою і з Ізраілем».
28 І быў там [Майсей] з ГОСПАДАМ сорак дзён і сорак начэй, хлеба ня еў і вады ня піў, і напісаў
на табліцах словы запавету, Дзесяць словаў.
29 І сталася, калі зыходзіў Майсей з гары Сынай, і дзьве табліцы Сьведчаньня [былі] ў руцэ
Майсея пры зыходзе яго з гары, а Майсей ня ведаў, што праменявала скура аблічча ягонага,
бо [Бог] гаварыў з ім.

30 І ўбачыў Аарон і ўсе сыны Ізраіля Майсея, і вось, праменявала скура аблічча ягонага, і
баяліся наблізіцца да яго.
31 І паклікаў іх Майсей, і зьвярнуліся да яго Аарон і ўсе начальнікі грамады, і прамовіў Майсей
да іх.
32 І пасьля гэтага наблізіліся ўсе сыны Ізраіля, і ён загадаў ім усё, што ГОСПАД прамовіў да яго
на гары Сынай.
33 І скончыў Майсей прамаўляць да іх, і ўсклаў на аблічча сваё заслону.
34 А калі Майсей узыходзіў перад аблічча ГОСПАДА, каб гаварыць з Ім, тады здыймаў заслону,
аж пакуль не выходзіў. І выйшаў, і прамаўляў да сыноў Ізраіля, што было загадана яму.
35 І бачылі сыны Ізраіля аблічча Майсея, што праменявала скура аблічча Майсея, і ўскладаў
Майсей заслону на аблічча сваё, пакуль не ўваходзіў, каб гаварыць [з Богам].

Вых 35

1 І сабраў Майсей усю грамаду сыноў Ізраіля, і сказаў: «Вось словы, якія загадаў ГОСПАД, каб
выконваць іх.
2 Шэсьць дзён будзеш рабіць работу, а ў сёмы дзень будзе ў вас сьвята, супачынак супачынку
для ГОСПАДА; кожны, хто будзе рабіць у ім работу, памрэ.
3 Не паліце агню ў-ва ўсіх сядзібах вашых у дзень супачынку».
4 І сказаў Майсей усёй грамадзе сыноў Ізраіля: «Гэта слова, якое загадаў ГОСПАД, кажучы:
5 “Зьбярыце ад сябе дар ГОСПАДУ. Кожны шляхетнага сэрца няхай прынясе дар ГОСПАДУ:
золата, срэбра і медзь,
6 і блакіт, і пурпур, і барвовы кармазын, і вісон, і казіную [поўсьць],
7 і скуры бараноў, фарбаваныя на чырвона, і скуры тахаш, і дрэва акацыі,
8 і алей для асьвятленьня, і пахошчы для алею памазаньня і для пахкага каджэньня,
9 і камяні оніксу, і камяні для аздабленьня эфоду і нагрудніку.
10 І ўсе з вас, хто мудры сэрцам, няхай прыйдуць і зробяць усё, што загадаў ГОСПАД:
11 Сялібу і намёт для яе, і пакрыцьцё для яе, гачыкі для яе і дошкі для яе, насілы яе, слупы яе і
падстаўкі яе,
12 Каўчэг [Сьведчаньня] і насілы для яго, накрыўку і заслону, якая вісіць,
13 стол і насілы для яго, і ўсё начыньне ягонае, і хлябы пакладныя,
14 і сьвечнік для асьвятленьня з начыньнямі ягонымі, і лямпы для яго, і алей для асьвятленьня,
15 і ахвярнік каджэньня, і насілы для яго, і алей памазаньня і пахкае кадзіла, і заслону на
ўваходзе ў Сялібу,
16 ахвярнік цэласпаленьня і крату мядзяную для яго, і насілы для яго, і ўсё начыньне ягонае,
мыцельнік і падставу ягоную,
17 заслоны панадворку, слупы ягоныя і падстаўкі іхнія, і заслону на ўваходзе ў панадворак,
18 калкі Сялібы і калкі панадворку, і вяроўкі да іх,
19 адзеньні службовыя для служэньня ў сьвятыні, і адзеньні сьвятыя для Аарона сьвятара, і
адзеньні для сыноў ягоных для служэньня сьвятарскага”».
20 І адыйшла ўся грамада сыноў Ізраіля ад аблічча Майсея.
21 І прыходзіў кожны чалавек, якога прынукала да гэтага сэрца ягонае, і кожны, якога
заахвочваў дух ягоны, і прыносілі дар ГОСПАДУ на выробленьне Намёту Спатканьня, і на ўсё
служэньне ў ім, і на адзеньні сьвятыя.
22 І прыходзілі мужчыны і жанчыны, усе ахвотнага сэрца, і прыносілі кольцы і завушніцы, і
пярсьцёнкі, і бранзалеты, і ўсялякія рэчы залатыя, і кожны, патрэсваючы, [складаў] золата
для ГОСПАДА [як ахвяру] патрэсваньня.
23 І кожны, у каго быў блакіт і пурпур, і барвовы кармазын, і вісон, і казіная поўсьць, і скуры
бараноў, фарбаваныя на чырвона, і скуры тахаш, прыносіў іх.
24 І кожны, хто ахвяроўваў дар срэбра і медзі, прыносіў гэты дар для ГОСПАДА. І кожны, у каго
знайшлося дрэва акацыі, прыносіў [яго] на ўсялякую патрэбу служэньня.

25 І ўсе жанчыны, мудрыя сэрцам, пралі рукамі сваімі і прыносілі пражу блакіту, пурпуру і
барвовага кармазыну, і вісону.
26 І ўсе жанчыны, якіх прынукала сэрца іхняе, пралі ў мудрасьці казіную [поўсьць].
27 А начальнікі прыносілі камяні оніксу і камяні для аздабленьня эфоду і нагрудніку,
28 і пахошчы, і алей для асьвятленьня, і алей памазаньня, і пахкае кадзіла.
29 Кожны мужчына і жанчына з сыноў Ізраіля, якіх заахвочвала сэрца іхняе прынесьці на
ўсялякую работу, якую ГОСПАД загадаў зрабіць рукою Майсея, прыносілі дабраахвотна для
ГОСПАДА.
30 І сказаў Майсей сынам Ізраіля: «Глядзіце, ГОСПАД паклікаў па іменьні Бэцалеэля, сына
Урыя, сына Хура, з калена Юды,
31 і напоўніў яго Духам Божым, мудрасьцю, разумнасьцю, веданьнем і [ўменьнем] да
ўсялякай працы,
32 і мастацкімі здольнасьцямі рабіць з золата, срэбра і медзі,
33 і абрабляць камяні для асаджэньня іх, і абрабляць дрэва, і рабіць [з ім] усялякую мастацкую
работу.
34 І здольнасьць вучыць даў у сэрца яго і Агаліява, сына Ахісамаха, з калена Дана.
35 І Ён напоўніў іх мудрасьцю сэрца, каб яны рабілі ўсякую працу разьбяра, і мастака, і
вышывальніка на блакіце, пурпуры, барвовым кармазыне і вісоне, і ткача, які робіць усякую
працу і мастацкі аздабляе [тканіну].

Вых 36

1 І зробіць Бэцалеэль, і Агаліяў, і кожны мудры сэрцам, якому даў ГОСПАД мудрасьць і
разумнасьць у нутры іхнім, каб маглі зрабіць усю працу для служэньня ў сьвятыні, усё, як
загадаў ГОСПАД».
2 І паклікаў Майсей Бэцалеэля, і Агаліява, і кожнага мудрага сэрцам, якому ГОСПАД даў
мудрасьць у сэрца ягонае, усіх, каго прынукала сэрца ягонае ўзяцца за працу і зрабіць яе.
3 І ўзялі яны ад аблічча Майсея ўсе дары, якія прынесьлі сыны Ізраіля на працы для служэньня
ў сьвятыні, каб зрабіць яе. І яны прыносілі да яго яшчэ дабраахвотна кожную раніцу.
4 І прыйшлі ўсе мудрыя, якія рабілі ўсялякія працы ў сьвятыні, кожны ад працы сваёй, якою
яны займаліся,
5 і сказалі Майсею, кажучы: «Народ вельмі шмат прыносіць, больш, чым патрэбна для працы,
якую загадаў ГОСПАД зрабіць».
6 І загадаў Майсей, і абвешчана было ўголас у табары, кажучы: «Ані мужчына, ані жанчына
няхай ня робяць ужо нічога як дар для сьвятыні». І перастаў народ прыносіць [дары].
7 І прынесенага на работу было даволі на ўсялякую працу, якую належала зрабіць, і яшчэ
заставалася.
8 І зрабілі ўсе мудрыя сэрцам, якія займаліся працаю ў Сялібе, дзесяць палотнаў з кручанага
вісону, блакіту, пурпуру і барвовага кармазыну, і херувімаў майстэрскай работай зрабілі на
іх.
9 Даўжыня аднаго палатна — дваццаць восем локцяў, а шырыня аднаго палатна — чатыры
локці. Адна мера для ўсіх палотнаў.
10 І злучыў [Бэцалеэль] пяць палотнаў адно з адным, і пяць [іншых] палотнаў злучыў адно з
адным.
11 І зрабіў пяцелькі з блакіту на краі аднаго палатна для спінаньня; гэтак зрабіў ён на краі
апошняга палатна, для спінаньня з іншага боку.
12 Пяцьдзясят пяцелек зрабіў ён на адным палатне, і пяцьдзясят пяцелек зрабіў на канцы
палатна для спінаньня з другім; пяцелькі гэтыя — насупраць адна адной.
13 І зрабіў пяцьдзясят гачыкаў залатых, і злучыў гачыкамі палотны адно з адным, і сталася
Сяліба адным [цэлым].
14 І зрабіў палотны з казінае [поўсьці] для намёту Сялібы; адзінаццаць палотнаў зрабіў іх.
15 Даўжыня аднаго палатна — трыццаць локцяў, і чатыры локці — шырыня аднаго палатна;
мера адна для адзінаццаці палотнаў.

16 І злучыў ён пяць палотнаў асобна, і шэсьць палотнаў асобна.
17 І зрабіў пяцьдзясят пяцелек на краі палатна на канцы для спінаньня, і пяцьдзясят пяцелек
зрабіў на краі палатна для спінаньня з іншага боку.
18 І зрабіў пяцьдзясят гачыкаў мядзяных для злучэньня намёту, каб быў адным [цэлым].
19 І зрабіў пакрыцьцё на намёт са скураў бараноў, фарбаваных на чырвона, і пакрыцьцё на
верх са скураў тахаш.
20 І зрабіў дошкі для Сялібы, якія будуць стаяць [проста], з дрэва акацыі.
21 Дзесяць локцяў — даўжыня дошкі, і паўтары локці — шырыня адной дошкі.
22 Па два шыпы ў кожнай дошцы, асаджаныя адзін насупраць другога; гэтак зрабіў ён у-ва ўсіх
дошках Сялібы.
23 І зрабіў дошкі для Сялібы — дваццаць дошак для паўднёвага боку, [што глядзіць] на
поўдзень.
24 І сорак срэбных падставак зрабіў пад дваццаць дошак: дзьве падстаўкі пад адну дошку да
двух шыпоў ейных, і дзьве падстаўкі пад другую дошку да двух шыпоў ейных.
25 І да другога боку сялібы, [што глядзіць] на поўнач, зрабіў дваццаць дошак,
26 і сорак падставак для іх срэбных: дзьве падстаўкі пад адну дошку, і дзьве падстаўкі пад
другую дошку.
27 І да задняга боку Сялібы, [што глядзіць] на захад, зрабіў шэсьць дошак.
28 І дзьве дошкі зрабіў для вуглоў Сялібы пры [заходнім] боку.
29 І яны былі злучаныя ўнізе, і разам злучаныя ўгары адным колцам. Гэтак зрабіў ён з імі
абедзьвума на абодвух вуглах.
30 І [так] было восем дошак, і падставак іхніх срэбных шаснаццаць, дзьве падстаўкі пад адну
дошку, і дзьве падстаўкі пад другую дошку.
31 І зрабіў ён жэрдкі з дрэва акацыі, пяць [жэрдак] да дошак аднаго боку сялібы,
32 і пяць жэрдак да дошак другога боку сялібы, і пяць жэрдак да дошак задняга боку сялібы.
33 І зрабіў сярэднюю жэрдку, што праходзіла пасярэдзіне дошак ад аднаго канца да другога.
34 І дошкі пакрыў золатам; і колцы на іх для ўкладаньня жэрдак зрабіў з золата, і жэрдкі
пакрыў золатам.
35 І зрабіў заслону з блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону; і мастацкай
работай зрабіў на ёй херувімаў.
36 І зрабіў да яе чатыры слупы з акацыі, і пакрыў іх золатам, і кручкі на іх — залатыя, і выліў
да іх чатыры падстаўкі срэбныя.
37 І зрабіў заслону на ўваходзе намёту з блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага
вісону, гафтаванае работы,
38 і слупоў для яе пяць з кручкамі да іх, і пакрыў вярхі іхнія і клямкі іхнія золатам, і [выліў] да
іх пяць падставак мядзяных.

Вых 37

1 І зрабіў Бэцалеэль каўчэг з дрэва акацыі; два локці з паловаю даўжыня яго, і паўтары локці
шырыня яго, і паўтары локці вышыня яго.
2 І пакрыў яго шчырым золатам унутры і звонку, і зрабіў наўкола яго вянок залаты.
3 І выліў да яго чатыры колцы залатыя, на чатырох кутах яго, два колцы на адным баку яго, і
два колцы на другім баку яго.
4 І зрабіў насілы з дрэва акацыі, і пакрыў іх золатам.
5 І ўлажыў насілы ў колцы па баках каўчэга, каб насіць каўчэг.
6 І зрабіў накрыўку са шчырага золата; два локці з паловаю даўжыня яе, і паўтары локці
шырыня яе.
7 І зрабіў двух херувімаў з золата; каванымі зрабіў іх з абодвух бакоў накрыўкі:
8 аднаго херувіма з гэтага канца, і аднаго херувіма з другога канца; разам з накрыўкай зрабіў
херувімаў на абодвух баках яе.

9 І былі херувімы распусьціўшы крылы ўгару, і захіналі крыламі сваімі накрыўку, а абліччамі
сваімі былі [зьвернуты] адзін да аднаго; да накрыўкі былі [зьвернуты] абліччы херувімаў.
10 І зрабіў стол з дрэва акацыі, два локці даўжыня яго, і локаць шырыня яго, і паўтары локці
вышыня яго.
11 І пакрыў яго шчырым золатам, і зрабіў яму вянок залаты наўкола.
12 І зрабіў яму наўкола ліштву шырынёю ў далонь, і зрабіў вянок залаты для ліштвы ягонай.
13 І выліў для яго чатыры колцы залатыя, і прыладзіў колцы да чатырох рагоў, якія пры
чатырох ножках ягоных.
14 Пры ліштвах былі колцы, каб укладаць насілы і насіць стол.
15 І зрабіў насілы з дрэва акацыі для нашэньня стала, і пакрыў іх золатам.
16 І зрабіў са шчырага золата начыньне, што на стале: місы ягоныя, і чашы ягоныя, кубкі
ягоныя і збаны, каб наліваць імі.
17 І зрабіў сьвечнік са шчырага золата, каваным зрабіў сьвечнік; падстава яго, і сьцябло яго,
чарачкі яго, яблыкі яго і кветкі яго выходзілі з яго.
18 І шэсьць сьцяблінаў выходзіла з бакоў яго: тры сьцябліны сьвечніка з аднаго боку яго, і тры
сьцябліны сьвечніка з другога боку яго.
19 Тры чарачкі, [падобныя] да мігдалу, з яблыкам і кветкаю, былі на адной сьцябліне, і тры
чарачкі, [падобныя] да мігдалу, з яблыкам і кветкаю, былі на другой сьцябліне. Гэтак на
шасьці сьцяблінах, што выходзяць са сьвечніка,
20 А на [камлі] сьвечніка былі чатыры чарачкі, [падобныя] да мігдалу, з яблыкам і кветкаю.
21 І яблык пад двума сьцяблінамі, [што выходзяць] з яго, і яблык пад двума сьцяблінамі, [што
выходзяць] з яго, і яблык пад двума галінамі, [што выходзяць] з яго, на шасьці сьцяблінах, што
выходзяць з яго.
22 Яблыкі іхнія і сьцябліны іхнія выходзілі з яго; ён увесь суцэльна каваны са шчырага золата.
23 І зрабіў сем лямпаў для яго, і абцужкі да яго, і папяльнічку да яго са шчырага золата.
24 З таленту золата шчырага зрабіў яго з усімі прыладамі ягонымі.
25 І зрабіў ахвярнік каджэньня з дрэва акацыі; локаць — даўжыня яго, і локаць — шырыня яго,
ён чатырохкутны; і два локці — вышыня ягоная; з яго выходзілі рогі ягоныя.
26 І пакрыў яго шчырым золатам, верх ягоны і сьценкі ягоныя наўкола, і рогі ягоныя, і зрабіў
да яго вянок залаты наўкола.
27 І два колцы залатыя зрабіў пад вянком ягоным на двух вуглах ягоных; з двух бакоў ягоных
зрабіў месцы да насілаў, каб насіць яго на іх.
28 І зрабіў насілы з дрэва акацыі, і пакрыў іх золатам.
29 І зрабіў алей памазаньня сьвятога і пахкае кадзіла чыстае, работы мяшальніка масьцяў.

Вых 38

1 І зрабіў ахвярнік цэласпаленьня з дрэва акацыі, пяць локцяў даўжыня яго і пяць локцяў
шырыня яго, ён чатырохкутны, і тры локці вышыня яго.
2 І зрабіў рогі ягоныя на чатырох вуглах ягоных, з яго выходзілі рогі ягоныя; і пакрыў іх
медзьдзю.
3 І зрабіў усе начыньні ахвярніка: гаршчкі, лапаткі, місы, відэльцы і кадзільніцы; усе начыньні
ягоныя зрабіў з медзі.
4 І зрабіў да ахвярніка крату, плеценай работы, мядзяную, пад вобадам зьнізу да паловы яго.
5 І выліў чатыры колцы на чатырох вуглах краты мядзянай, каб укладаць насілы.
6 І зрабіў насілы з дрэва акацыі, і пакрыў іх медзьдзю.
7 І ўлажыў насілы ў колцы на баках ахвярніка для нашэньня яго імі. Пустым унутры зрабіў яго
з дошак.
8 І зрабіў мыцельнік мядзяны і падставу ягоную мядзяную з люстэрак жанчынаў, якія
зьбіраліся каля ўваходу ў Намёт Спатканьня.
9 І зрабіў панадворак: з паўднёвага боку, [што глядзіць] на поўдзень — заслоны з кручанага
вісону ў сто локцяў,

10 слупоў да іх дваццаць і падставак да іх дваццаць мядзяных, а кручкі на слупах і клямкі да іх
срэбныя.
11 І на паўночным баку — [заслоны] ў сто локцяў, слупоў да іх дваццаць і падставак да іх
дваццаць мядзяных; а кручкі на слупах і клямкі да іх — срэбныя.
12 І з заходняга боку — заслоны ў пяцьдзясят локцяў, слупоў да іх дзесяць і падставак да іх
дзесяць; а кручкі на слупах і клямкі да іх — срэбныя.
13 І з пярэдняга боку, [што глядзіць] на ўсход — [адлегласьць] у пяцьдзясят локцяў.
14 Пятнаццаць локцяў — заслоны з [аднаго] краю, слупоў да іх тры і падставак да іх тры.
15 І з другога краю, з іншага [боку] брамы панадворку — заслоны ў пятнаццаць локцяў; слупоў
да іх тры і падставак да іх тры.
16 Усе заслоны вакол панадворку — з кручанага вісону,
17 і падстаўкі да слупоў мядзяныя, кручкі на слупах і клямкі да іх — срэбныя, і пакрытыя вярхі
іхнія срэбрам, і ўсе яны павязаныя срэбрам, усе слупы панадворку.
18 Заслона для брамы панадворку — гафтаванае работы з блакіту, пурпуру, барвовага
кармазыну і кручанага вісону, дваццаць локцяў — даўжыня [яе], а вышыня і шырыня [яе] —
пяць локцяў, падобна да іншых заслонаў панадворку;
19 і слупоў да яе чатыры, і падставак да іх чатыры мядзяных; кручкі іхнія срэбныя, і пакрыцьцё
вярхоў іх і клямкі да іх срэбныя.
20 А ўсе калкі Сялібы і панадворку наўкола — мядзяныя.
21 Вось каштарыс Сялібы, Сялібы Сьведчаньня, які падлічаны паводле словаў Майсея працаю
лявітаў пад рукою Ітамара, сына Аарона, сьвятара.
22 І Бэцалеэль, сын Урыя, сын Хура, з калена Юды, зрабіў усё, што загадаў ГОСПАД Майсею;
23 а з ім Агаліяў, сын Ахісамаха, з калена Дана, разьбяр і мастак, і вышывальнік на блакіце,
пурпуры, барвовым кармазыне і вісоне.
24 Усяго золата, ужытага на работу, на ўсе працы ў сьвятыні, — а было гэта золата,
[ахвяраванае] патрэсваньнем, — было дваццаць дзевяць талентаў і сямсот трыццаць сыкляў,
паводле сыкля сьвятыні.
25 А срэбра ад палічаных у грамадзе [было] сто талентаў і тысяча сямсот семдзясят пяць
сыкляў, паводле сыкля сьвятыні.
26 Бэка з галавы, [значыцца,] палова сыкля, паводле сыкля сьвятыні, з кожнага, хто прыйшоў,
каб быць палічаным, ад дваццаці гадоў і вышэй, з шасьцісот трох тысячаў пяцьсот пяцідзесяці
[чалавек].
27 І было сто талентаў срэбра ўжыта на адліцьцё падставак сьвятыні і падставак заслонаў; сто
падставак са ста талентаў, па таленту на падстаўку.
28 А з тысячы сямсот сямідзесяці пяці [сыкляў] зрабіў [Бэцалеэль] кручкі на слупах, і пакрыў
вярхі іхнія, і злучыў іх клямкамі.
29 А медзі, [ахвяраванай] патрэсваньнем, было семдзясят талентаў і дзьве тысячы чатырыста
сыкляў.
30 І зрабіў ён з яе падстаўкі да слупоў каля ўваходу ў Намёт Спатканьня, і ахвярнік мядзяны, і
крату мядзяную да яго, і ўсё начыньне ахвярніка,
31 і падстаўкі панадворку наўкола, і падстаўкі брамы панадворку, і ўсе калкі Сялібы, і ўсе калкі
панадворку наўкола.

Вых 39

1 А з блакіту, пурпуру і барвовага кармазыну зрабілі яны службовыя адзеньні для служэньня
ў сьвятыні; і зрабілі адзеньні сьвятыя для Аарона, як загадаў ГОСПАД Майсею.
2 І зрабіў [Бэцалеэль] эфод з золата, блакіту, пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону.
3 І выкляпалі яны бляшкі залатыя, і павыціналі з іх ніткі, каб уплесьці іх у блакіт, пурпур,
барвовы кармазын і вісон мастацкаю работаю.
4 Нараменьнікі зрабілі да яго злучаныя; на двух канцах сваіх яны былі злучаныя.

5 І пас эфоду, які [падпярэзвае] яго, аднолькавае з ім работы, з золата, блакіту, пурпуру,
барвовага кармазыну і кручанага вісону, як загадаў ГОСПАД Майсею.
6 І зрабілі камяні оніксу, асадзіўшы іх у аправы залатыя, і выразалі на іх, як выразаюць пячатку,
імёны сыноў Ізраіля.
7 І палажыў ён іх на нараменьнікі эфоду, як камяні на ўспамін пра сыноў Ізраіля, як загадаў
ГОСПАД Майсею.
8 І зрабіў нагруднік мастацкаю работаю, такою самаю работаю, як эфод, з золата, блакіту,
пурпуру, барвовага кармазыну і кручанага вісону.
9 Ён быў чатырохкутны; падвойным зрабілі яны нагруднік, у пядзю даўжыня ягоная і ў пядзю
шырыня ягоная, ён падвойны.
10 І напоўнілі яго чатырма шэрагамі камянёў у шэраг. Рубін, тапаз і шмарагд — шэраг адзін.
11 А шэраг другі — гранат, шафір і дыямэнт.
12 А шэраг трэці — яхонт, агат і амэтыст.
13 А шэраг чацьвёрты — хрызаліт, онікс і ясьпіс. Яны асаджаныя ў золата ў аправах сваіх.
14 І камяні паводле [імёнаў] імёнаў сыноў Ізраіля, іх дванаццаць паводле імёнаў іхніх, і
выразанае як пячатка на кожным імя сваё паводле дванаццаці плямёнаў.
15 І зрабілі для нагрудніку ланцужкі плеценыя вітою работаю, са шчырага золата.
16 І зрабілі дзьве аправы залатыя і два колцы залатыя, і прымацавалі два колцы да двух канцоў
нагрудніку.
17 І ўклалі два плеценыя залатыя ланцужкі ў абодва колцы па канцах нагрудніку.
18 А [іншыя] два канцы двух ланцужкоў прычапілі да двух аправаў і прымацавалі іх да
нараменьнікаў эфоду з пярэдняга боку яго.
19 І зрабілі два колцы залатыя, і прымацавалі да двух канцоў нагрудніку на тым краі ягоным,
які пры ўнутраным боку эфоду.
20 І зрабілі два колцы залатыя, і прымацавалі іх да двух нараменьнікаў эфоду зьнізу, з
пярэдняга боку ягонага, каля злучэньня ягонага, над пасам эфоду.
21 І прымацавалі нагруднік колцамі ягонымі да колцаў эфоду шнурком з блакіту, каб ён быў
над пасам эфоду, і каб ня ссоваўся нагруднік з эфоду, як загадаў ГОСПАД Майсею.
22 І зрабіў [Бэцалеэль] верхнюю шату да эфоду, тканую ўсю з блакіту,
23 і адтуліну шаты ў сярэдзіне яе, як адтуліна панцыра, і абшыўку наўкола адтуліны, каб не
разьдзёрлася.
24 І зрабілі яны на прыполе верхняе шаты яблыкі гранатовыя з блакіту, пурпуру і барвовага
кармазыну кручанага.
25 І зрабілі званочкі са шчырага золата, і памясьцілі званочкі паміж гранатовых яблыкаў на
прыполе верхняе шаты наўкола, паміж гранатовых яблыкаў,
26 званочак і гранатовы яблык, званочак і гранатовы яблык, на прыполе верхняе шаты наўкола
для служэньня, як загадаў ГОСПАД Майсею.
27 І зрабілі хітоны з вісону, тканае работы, для Аарона і сыноў ягоных,
28 і мітру з вісону, і турбаны аздобныя з вісону, і нагавіцы ільняныя з кручанага вісону,
29 і пояс з кручанага вісону, блакіту, пурпуру і барвовага кармазыну, гафтаванае работы, як
загадаў ГОСПАД Майсею.
30 І зрабілі дыядэму вянца сьвятасьці са шчырага золата, і напісалі на ёй пісьмом, як
выразаюць на пячатцы: “Сьвятыня для ГОСПАДА”,
31 і прымацавалі да яе шнурок з блакіту, каб прывязваць яе да мітры зьверху, як загадаў
ГОСПАД Майсею.
32 І скончылася ўся праца пабудовы Сялібы, Намёту Спатканьня, і зрабілі сыны Ізраіля ўсё; як
загадаў ГОСПАД Майсею, так і зрабілі.
33 І прынесьлі да Майсея Сялібу, намёт і ўсе прыналежнасьці ягоныя, гачыкі ягоныя, дошкі
ягоныя, жэрдкі ягоныя, слупы ягоныя і падстаўкі ягоныя,
34 і пакрыцьцё са скураў бараноў, фарбаваных на чырвона, і пакрыцьцё са скураў тахаш, і
заслону, якая вісіць,

35 Каўчэг Сьведчаньня, і насілы ягоныя, і накрыўку ягоную,
36 стол, усе начыньні ягоныя і хлябы пакладныя,
37 сьвечнік чысты, лямпы ягоныя, лямпы ў шэрагах, і ўсё начыньне ягонае, і алей для асьвятленьня,
38 і ахвярнік залаты, і алей памазаньня, і пахкае кадзіла, і заслону на ўваходзе ў намёт,
39 ахвярнік мядзяны і крату мядзяную да яго, насілы ягоныя і ўсё начыньне ягонае, мыцельнік і падставу ягоную,
40 заслоны панадворку, слупы ягоныя і падстаўкі ягоныя, заслону да брамы панадворку, вяроўкі ягоныя і калкі ягоныя, і ўсе прыналежнасьці да служэньня Сялібы ў Намёце Спатканьня,
41 адзеньні службовыя да служэньня ў сьвятыні, адзеньні сьвятыя для Аарона сьвятара і адзеньні для сыноў ягоных да служэньня сьвятарскага.
42 Усё, як загадаў ГОСПАД Майсею, так і зрабілі сыны Ізраіля, усю працу.
43 І ўбачыў Майсей усё зробленае, і вось, яны зрабілі гэта; як загадаў ГОСПАД, так і зрабілі. І дабраславіў іх Майсей.

Вых 40

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «У першы месяц, у першы дзень месяца паставіш Сялібу Намёту Спатканьня.
3 І паставіш там Каўчэг Сьведчаньня, і закрыеш Каўчэг заслонаю.
4 І ўнясеш стол, і разложыш на ім тое, што належыць, і ўнясеш сьвечнік, і запаліш лямпы ягоныя.
5 І паставіш ахвярнік залаты для каджэньня перад Каўчэгам Сьведчаньня; і завесіш заслону на ўваходзе ў Сялібу.
6 І паставіш ахвярнік цэласпаленьня перад уваходам у Сялібу Намёту Спатканьня.
7 І паставіш мыцельнік паміж Намётам Спатканьня і ахвярнікам, і нальеш у яго вады.
8 І паставіш панадворак наўкола, і завесіш заслону ў браме панадворку.
9 І возьмеш алей памазаньня, і памажаш Сялібу і ўсё, што ў ёй, і асьвяціш яе і ўсе прыналежнасьці ейныя, і будзе Сьвятой.
10 І памажаш ахвярнік цэласпаленьня і ўсё начыньне ягонае, і асьвяціш ахвярнік, і будзе ахвярнік Сьвятым Сьвятых.
11 І памажаш мыцельнік і падставу ягоную, і асьвяціш яго.
12 І наблізіш Аарона і сыноў ягоных да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і абмыеш іх вадою.
13 І апранеш Аарона ў адзеньні сьвятыя, і памажаш яго, і асьвяціш яго, і ён будзе сьвятаром Маім.
14 І сыноў ягоных наблізіш, і апранеш іх у хітоны,
15 і памажаш іх, як ты памазаў бацьку іхняга, і яны будуць сьвятарамі Маімі, і будзе ім памазаньне іхняе на сьвятарства вечнае ў пакаленьнях іхніх».
16 І зрабіў Майсей усё; як загадаў яму ГОСПАД, так і зрабіў.
17 І сталася, у першы месяц другога году, у першы дзень месяца была пастаўлена Сяліба.
18 І паставіў Майсей Сялібу, і палажыў падстаўкі яе, і паставіў дошкі яе, і палажыў жэрдкі яе, і паставіў слупы яе,
19 і расьцягнуў намёт над Сялібай, і палажыў пакрыцьцё намёту зьверху над ім, як загадаў ГОСПАД Майсею.
20 І ўзяў, і палажыў Сьведчаньне ў Каўчэг, і ўлажыў насілы ў Каўчэг, і палажыў накрыўку на Каўчэг зьверху.
21 І ўнёс Каўчэг у Сялібу, і завесіў заслону, якая вісіць, і засланіў ёю Каўчэг Сьведчаньня, як загадаў ГОСПАД Майсею.
22 І паставіў стол у Намёт Спатканьня, на паўночным баку Сялібы, звонку ад заслоны.
23 І разлажыў шэрагі хлябоў перад абліччам ГОСПАДА, як загадаў ГОСПАД Майсею.
24 І паставіў сьвечнік у Намёт Спатканьня насупраць стала, на паўднёвым баку Сялібы.
25 І запаліў лямпы перад абліччам ГОСПАДА, як загадаў ГОСПАД Майсею.

26 І паставіў ахвярнік залаты ў Намёце Спатканьня перад заслонаю.
27 І кадзіў на ім пахкім кадзілам, як загадаў ГОСПАД Майсею.
28 І завесіў заслону на ўваходзе ў Сялібу.
29 І ахвярнік цэласпаленьня паставіў каля ўваходу ў Сялібу Намёту Спатканьня, і ахвяраваў на ім цэласпаленьне і ахвяру хлебную, як загадаў ГОСПАД Майсею.
30 І паставіў мыцельнік паміж Намётам Спатканьня і ахвярнікам, і наліў у яго вады для абмываньня.
31 І абмывалі ў ім Майсей і Аарон, і сыны ягоныя рукі свае і ногі свае.
32 Калі ўваходзілі ў Намёт Спатканьня і калі набліжаліся да ахвярніка, яны абмываліся, як загадаў ГОСПАД Майсею.
33 І паставіў панадворак вакол Сялібы і ахвярніка, і завесіў заслону ў браме панадворку. І скончыў Майсей работу.
34 І закрыла воблака Намёт Спатканьня, і слава ГОСПАДА напоўніла Сялібу.
35 І ня мог Майсей увайсьці ў Намёт Спатканьня, бо ляжала на ім воблака, і слава ГОСПАДА напаўняла Сялібу.
36 І калі падымалася воблака па-над Сялібаю, тады вырушалі сыны Ізраіля ў-ва ўсе падарожжы свае.
37 А калі не падымалася воблака, тады не вырушалі, аж да дня, калі яно падымалася.
38 Бо воблака ГОСПАДА было над Сялібай удзень, і агонь быў над ёй уначы перад вачыма ўсяго дому Ізраіля ў-ва ўсіх падарожжах іхніх.

КНІГА ЛЯВІТ

1 І паклікаў ГОСПАД Майсея, і прамовіў да яго з Намёту Спатканьня, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі хто з вас захоча скласьці ахвяру з хатняе жывёлы,
няхай складае [ахвяру] з валоў або жывёл драбнейшых.
3 Калі ён захоча скласьці ахвяру цэласпаленьня з быдла, няхай ахвяруе самца без заганы і
прывядзе яго да ўваходу Намёту Спатканьня, каб ГОСПАД прыняў яго ласкава,
4 і паложыць руку на галаву ахвяры, каб была прынята як перамаленьне за яго.
5 Потым заб’е цяля перад ГОСПАДАМ, а сыны Аарона, сьвятары, ахвяруюць кроў і пакрапяць
ёю кругом ахвярнік, які стаіць перад уваходам у Намёт Спатканьня;
6 а пасьля здыме ён скуру з ахвяры цэласпаленьня і пасячэ ахвяру на часткі.
7 Сыны ж Аарона, сьвятары, прынясуць агонь на ахвярнік і паложаць дровы на агні.
8 Потым сыны Аарона, сьвятары, паложаць часткі разам з галавой і тлушчам на дровах, што
ляжаць на агні на ахвярніку.
9 А нутро ахвяры і ногі яе вымые ён вадою, і спаліць сьвятар усё гэта на ахвярніку; гэта
цэласпаленьне, ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ.
10 Калі вось хто хоча скласьці ахвяру цэласпаленьня з дробнай жывёлы, з авечак або козаў,
няхай возьме самца без заганы,
11 і заб’е яго перад ГОСПАДАМ на паўночным баку ахвярніка, а сыны Аарона, сьвятары,
пакропяць крывёй яго ахвярнік наўкола.
12 І расьсячэ яго на часткі, а сьвятар паложыць іх разам з галавой і тлушчам на дровы, што
ляжаць на агні на ахвярніку,
13 а нутро і ногі вымые ён вадой; і сьвятар зложыць гэта ўсё на ахвярніку і спаліць; гэта
цэласпаленьне, ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ.
14 А калі хто захоча скласьці ў ахвяру ГОСПАДУ птушку на цэласпаленьне, няхай ахвяруе
туркаўку або маладога галуба.
15 І сьвятар прынясе яго на ахвярнік, зломіць яму галаву і спаліць на ахвярніку, а кроў яго
выцісьне на сьцяну ахвярніка;
16 і возьме валяк з пер’ем, і выкіне каля ахвярніку на ўсходнім баку, дзе попел;
17 і надломіць яго паміж крыламі, не аддзяляючы іх, і спаліць іх сьвятар на ахвярніку, на
дровах, што ляжаць на агні; гэта цэласпаленьне, ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ.

Ляв 2

1 Калі хто захоча скласьці ахвяру хлебную ГОСПАДУ, няхай прынясе пшанічнай мукі, зьмяшае
яе з алеем і дадасьць да яе кадзіла,
2 потым прынясе яе да сьвятароў, сыноў Аарона, і возьме сьвятар поўную жменю мукі з алеем
і з усім кадзілам і спаліць гэта як памятную частку на ахвярніку; гэта ахвяра агнявая, мілы
пах ГОСПАДУ.
3 А што застанецца ад ахвяры хлебнай, будзе для Аарона і сыноў ягоных. Гэта сьвятое сьвятых
з ахвяраў агнявых для ГОСПАДА.
4 Калі захочаш скласьці ахвяру хлебную, з мукі, печанай у печы, няхай гэта будуць праснакі,
запраўленыя алеем, ці аладкі прэсныя, памазаныя алеем.
5 Калі ахвяра тая будзе з патэльні, няхай будзе з пшанічнай мукі, няквашанай, запраўленай
алеем.
6 Падзеліш яе на кавалкі і пальеш яе алеем. Гэта ахвяра хлебная.
7 Калі ахвяра твая будзе ў гаршчку смажаная, няхай яна будзе з мукі, запраўленай алеем.
8 Тады прынясеш гэтак прыгатаваную ахвяру ГОСПАДУ і аддасі яе ў рукі сьвятара, а ён прынясе
яе да ахвярніка;
9 і возьме сьвятар памятную частку яе, і спаліць на ахвярніку; гэта ахвяра агнявая, мілы пах
ГОСПАДУ.
10 А ўсё, што застанецца, будзе для Аарона і сыноў ягоных. Гэта сьвятое сьвятых з ахвяраў
агнявых для ГОСПАДА.

11 Усякая ахвяра з мукі, якую складаеце Госпаду, няхай ня будзе квашанай, бо анічога
квашанага, ані мёду не павінны вы паліць у ахвяру ГОСПАДУ.
12 Прыносьце гэтыя рэчы як пяршыны, як дары ГОСПАДУ, але не кладзіце іх на ахвярнік, каб
паліць на пах прыемны.
13 Кожную ахвяру, якую складаеш з ежы, пасалі сольлю. І не пакідай хлебнай ахвяры тваёй
бяз солі запавету Бога твайго. Кожную ахвяру тваю пасалі сольлю.
14 Калі прыносіш ахвяру з пяршынаў пладоў тваіх ГОСПАДУ, прынось каласы, высушаныя на
агні, або тоўчанае зерне як ахвяру хлебную,
15 палі іх алеем і палажы на іх кадзіла. Гэта ахвяра хлебная.
16 І спаліць сьвятар як памятную частку з тоўчанага зерня і алею з усім кадзілам. Гэта ахвяра
агнявая для ГОСПАДА.

Ляв 3

1 Калі чыя ахвяра ёсьць ахвярай мірнай, ён складае яе з валоў; самца або саміцу без заганы
няхай прыносіць ГОСПАДУ,
2 і паложыць руку сваю на галаву ахвяры сваёй, якую заб'е перад уваходам у Намёт
Спатканьня, а пасьля сьвятары, сыны Аарона, пакропяць ахвярнік крывёю яе наўкола.
3 І складзе ён з ахвяры мірнай ахвяру цэласпаленьня ГОСПАДУ з тлустасьці, што пакрывае
нутро, і ўвесь тлушч, які над ім,
4 а таксама абедзьве ныркі і тлушч на іх, які на сьцёгнах, і тлушч, які на вантробе; разам з
ныркамі няхай аддзеліць яго.
5 І сыны Аарона спаляць гэта на ахвярніку як цэласпаленьне на дровах, якія на агні; гэта ахвяра
цэласпаленьня, мілы пах ГОСПАДУ.
6 Калі б чыя ахвяра складалася з дробнай жывёлы як ахвяра мірная для ГОСПАДА, няхай
складае ахвяру з жывёлы без заганы, самца або саміцы.
7 Калі з авечак ён прыносіць ахвяру, няхай прынясе яе перад аблічча ГОСПАДА,
8 і паложыць руку сваю на галаву ахвяры сваёй, і потым заб'е яе перад Намётам Спатканьня, а
сыны Аарона пакропяць крывёю яе ахвярнік наўкола.
9 І складзе ён як ахвяру мірную ГОСПАДУ тлушч яе, увесь курдзюк, адрэзаўшы яго па самую
хрыбетную косьць, і тлушч, які пакрывае нутро, і ўвесь тлушч над ім,
10 і абедзьве ныркі і тлушч на іх, які на сьцёгнах, і тлушч, які на вантробе; разам з ныркамі
няхай аддзеліць яго.
11 І сьвятар спаліць гэта на ахвярніку. Гэта хлеб, ахвяра агнявая для ГОСПАДА.
12 Калі б хто складаў ахвяру з козаў, няхай прынясе яе перад аблічча ГОСПАДА,
13 і паложыць ён руку сваю на галаву яе і заб'е яе перад Намётам Спатканьня, а сыны Аарона
пакропяць крывёй яе ахвярнік наўкола.
14 І складзе ён з яе ахвяру сваю як ахвяру агнявую для ГОСПАДА — тлушч, які пакрывае нутро,
разам увесь тлушч, які на нутры,
15 і абедзьве ныркі разам з тлушчам на іх, які на сцёгнах, а таксама тлушч, які на вантробе; з
ныркамі няхай аддзеліць яго.
16 Пасьля сьвятар спаліць усё гэта на ахвярніку; гэта хлеб, ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ;
увесь тлушч [належыць] ГОСПАДУ.
17 Гэта пастанова вечная для пакаленьняў вашых у-ва ўсіх паселішчах вашых: ані крыві, ані
тлушчу зусім ня ешце"».

Ляв 4

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Гавары сынам Ізраіля: "Калі хто праз няўвагу саграшыць адносна прыказаньняў ГОСПАДА,
якія забараняюць нешта рабіць, а ён гэта зрабіў бы,
3 дык калі гэтага грэху дапусьціцца памазаны сьвятар, так што яго віна спадае на народ, тады
складзе ён у ахвяру ГОСПАДУ як перамольную ахвяру за дапушчаны грэх маладога бычка без
заганы.

4 І прывядзе бычка да ўваходу ў Намёт Спатканьня перад аблічча ГОСПАДА, і паложыць руку
на галаву яго, і заб'е яго перад абліччам ГОСПАДА.
5 І памазаны сьвятар возьме крыві таго бычка, і ўнясе ў Намёт Спатканьня.
6 І памочыць сьвятар палец у крыві, і пакропіць крывёй сем разоў перад абліччам ГОСПАДА,
перад заслонай Месца Сьвятога.
7 І памажа сьвятар крывёй рагі ахвярніка пахкага каджэньня, які перад абліччам ГОСПАДА ў
Намёце Спатканьня, а рэшту крыві бычка вылье ён на падставу ахвярніка цэласпаленьня, які
перад уваходам у Намёт Спатканьня.
8 І выме з ахвяраванага бычка ўвесь тлушч, які пакрывае нутро, і ўсю тлустасьць, якая на
нутры,
9 і абедзьве ныркі разам з тлушчам, які над імі, які дастае да сьцёгнаў, а таксама тлушч, які на
вантробе; разам з ныркамі няхай аддзеліць яго,
10 такім жа чынам, як аддзяляецца тлушч бычка ахвяры мірнай. І спаліць сьвятар усё гэта на
ахвярніку цэласпаленьня.
11 А скуру цяляці, усё мяса ягонае, галаву ягоную, ногі ягоныя, і нутро ягонае, і нячыстасьць
ягоную,
12 усяго бычка няхай вынясуць па-за табар; на чыстае месца, дзе высыпаюць попел, і там няхай
будзе спалены агнём на дровах.
13 Калі ўся грамада Ізраіля саграшыць праз няўвагу, і схавана гэта будзе перад вачыма царквы,
што такім чынам правініліся супраць прыказаньняў ГОСПАДА,
14 а потым яны зразумеюць грэх, якім саграшылі, дык няхай царква прывядзе да ўваходу ў
Намёт Спатканьня бычка ў ахвяру за грэх.
15 І старшыні грамады ўскладуць рукі на галаву бычка перад абліччам ГОСПАДА, і той бычок
будзе забіты перад абліччам ГОСПАДА.
16 І памазаны сьвятар унясе ў Намёт Спатканьня частку крыві цяляці,
17 і памочыць палец у крыві, і пакропіць сем разоў перад абліччам ГОСПАДА перад заслонай.
18 І памажа тою крывёю рагі ахвярніку, які перад абліччам ГОСПАДА ў Намёце Спатканьня,
а рэшту крыві вылье на падставу ахвярніка цэласпаленьня, які каля ўваходу ў Намёт
Спатканьня.
19 А ўвесь тлушч яго аддзеліць ад яго і спаліць на ахвярніку.
20 І зробіць з бычком тое, што робіцца з бычком ахвяры за грэх; так павінен зрабіць з ім. Так
ачысьціць іх сьвятар, і будзе даравана ім.
21 І вынясе бычка па-за табар, і спаліць яго так, як спаліў папярэдняга бычка. Гэта ахвяра
перамольная за грэх царквы.
22 Калі саграшыць князь і праз няўвагу дапусьціцца таго, што забараняецца прыказаньнем
ГОСПАДА, Бога ягонага, і гэтак правініцца,
23 калі будзе даведзены грэх ягоны, якім саграшыў, няхай прывядзе ў ахвяру ГОСПАДУ казла
без заганы.
24 І паложыць ён руку сваю на галаву ягоную, і заб'е яго на месцы, дзе забіваюцца ахвяры
цэласпаленьня перад абліччам ГОСПАДА. Гэта ахвяра за грэх.
25 І памочыць сьвятар палец у крыві ахвяры за грэх, і памажа ёю рагі ахвярніка цэласпаленьня,
а рэшту крыві вылье на падставу ахвярніка цэласпаленьня.
26 А ўвесь тлушч яго спаліць на ахвярніку, падобна як тлушч ахвяры мірнай. Так вось
ачысьціць яго сьвятар ад грэху ягонага, і будзе яму даравана.
27 Калі хто спаміж народу зямлі праз няўвагу саграшыць і дапусьціцца таго, што забараняецца
прыказаньнем ГОСПАДА, і гэтак правініцца,
28 калі будзе выяўлены яму грэх ягоны, якім саграшыў, няхай прывядзе ў ахвяру за грэх свой
казу без заганы.
29 Пасьля паложыць руку на галаву ахвяры за грэх, і заб'е яе на месцы ахвяры цэласпаленьня.
30 Сьвятар возьме пальцам сваім крыві і памажа ёю рагі ахвярніка цэласпаленьня, а рэшту
вылье на падставу ахвярніка.

31 Потым аддзеліць увесь тлушч так, як быў аддзелены тлушч ахвяры мірнай. І спаліць яго сьвятар на ахвярніку на мілы пах ГОСПАДУ. Так ачысьціць яго сьвятар, і грэх будзе яму адпушчаны.
32 А калі хто захоча скласьці за грэх авечку, няхай прывядзе авечку без заганы,
33 узложыць руку на галаву ейную і заб'е яе як ахвяру за грэх на месцы, дзе забіваюць ахвяры цэласпаленьня.
34 І возьме сьвятар пальцам сваім крыві і памажа рагі ахвярніку цэласпаленьня, а рэшту вылье на падставу ахвярніка.
35 А ўвесь тлушч яе аддзеліць, як аддзяляецца лой авечкі з ахвяры мірнай, і спаліць яго сьвятар на ахвярніку ў ахвяру ГОСПАДУ. Так ачысьціць яго сьвятар ад грэху, якім ён саграшыў, і будзе яму даравана.

Ляв 5

1 Калі хто саграшыць тым, што чуў праклён і мог засьведчыць пра праступак, які бачыў або ведаў, і не зрабіў гэтага, і такім чынам правініўся,
2 або калі хто дакранецца чаго нячыстага, трупа зьвера нячыстага, або жывёлы, або паўзуна нячыстага, але ня будзе ведаць гэтага, што стаўся нячыстым, і гэтак правініўся,
3 або калі нехта дакранецца нейкай нячыстасьці чалавечай, нейкай рэчы нячыстай, дзеля якой мог занячысьціцца, і спачатку не ўсьведамляў сабе гэтага, а потым даведаецца, што правініўся,
4 або калі хто прысягае, гаворачы легкадумна вуснамі на ліха або на дабро, так як бывае, што чалавек легкадумна прысягае, спачатку не ўсьведамляючы сабе гэтага, а пасьля спасьцерагае, што правініўся праз адну з гэтых рэчаў,
5 дык калі хто правініўся ў адной з гэтых рэчаў, няхай прызнаецца, што саграшыў,
6 і няхай прынясе ён ГОСПАДУ за грэх свой, якім саграшыў, у ахвяру перамольную авечку са статку або казу як ахвяру за грэх, і ачысьціць яго сьвятар ад грэху ягонага.
7 Калі хто ня можа ахвяраваць авечку, няхай ахвяруе за грэх свой дзьве туркаўкі або двух маладых галубоў ГОСПАДУ: аднаго ў ахвяру за грэх, а другога на цэласпаленьне.
8 Няхай прынясе іх да сьвятара, і ён першага ахвяруе за грэх і надломіць яму галаву пры карку, але яе не аддзеліць.
9 Пасьля пакропіць крывёй яго сьцяну ахвярніку, а рэшту крыві вылье на падставу ахвярніка. Гэта ахвяра за грэх.
10 Другога галуба няхай складзе ён у ахвяру цэласпаленьня, як звычайна бывае; так ачысьціць яго сьвятар ад грэху яго, якім ён правініўся, і ён будзе яму адпушчаны.
11 Калі б хто ня мог ахвяраваць дзьвюх туркавак або двух маладых галубоў, няхай прынясе за тое, што саграшыў, дзясятую частку эфы пшанічнай мукі ў ахвяру за грэх; няхай не палівае яе алеем і няхай не кладзе на яе кадзіла, бо гэта ахвяра за грэх.
12 І прынясе яе да сьвятара, а той возьме з гэтага поўную жменю [мукі] як памятную частку і спаліць на ахвярніку ў ахвяру ГОСПАДУ. Гэта ахвяра за грэх.
13 Так ачысьціць яго сьвятар ад грэху ягонага, якім ён саграшыў супраць аднаго з тых прыказаньняў, і будзе яму адпушчана. Пазасталую частку возьме сьвятар як ахвяру хлебную"».
14 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
15 «Калі хто дапусьціцца злачынства праз памылку, прысвойваючы сабе рэчы, пасьвячоныя ГОСПАДУ, няхай за віну сваю са свайго статку авечак прынясе ГОСПАДУ ягня без заганы па цане двух сыкляў срэбра паводле вагі сьвятыні як ахвяру за грэх.
16 Няхай тое, што прысвоіў, верне і дадасьць да таго пятую частку вартасьці, і аддасьць гэта сьвятару, а сьвятар ачысьціць яго ахвярай ягняці, і грэх будзе яму адпушчаны.
17 Калі хто саграшыць, дапускаючыся нечага супраць прыказаньняў ГОСПАДА праз няведаньне, і правініцца, дапускаючыся злачынства,

18 няхай прынясе да сьвятара ягня без заганы, узятае са статку, па сваёй ацэнцы, у ахвяру за
грэх. Тады сьвятар ачысьціць яго ад праступку, якога несьвядома дапусьціўся, і будзе ён яму
адпушчаны.
19 Гэта ахвяра за праступак, якім ён правініўся перад ГОСПАДАМ».

Ляв 6

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Калі хто саграшыць і дапусьціцца праступку перад ГОСПАДАМ тым, што адмовіцца аддаць
бліжняму тое, што яму было дадзена на захаваньне, або што яму было дадзена ў заклад, або
што было ім скрадзена, або што было адабрана яшчэ якім чынам [у бліжняга],
3 або калі знайшоў ён згубленую рэч і запярэчыў гэтаму, або што фальшыва сьведчыў адносна
якой рэчы, праз якую чалавек можа саграшыць,
4 вось жа хто так саграшыў і мусіць аднагарадзіцца, павінен аддаць тое, што ўкраў, або тое,
што адабраў, або што яму было даручана на захаваньне, або згубленае, што ён знайшоў,
5 або рэч, адносна якой прысягаў фальшыва, і няхай ён верне поўную вартасьць той рэчы,
дадаючы пры тым да яе пятую частку яе вартасьці. Павінен ён аддаць гэта ўласьніку ў той
самы дзень, калі будзе складаць ахвяру аднагараджэньня.
6 А за праступак ахвяруе ён ГОСПАДУ ягня без заганы са статку, паводле ацаненьня твайго, на
ахвяру аднагараджэньня, і прывядзе яго да сьвятара.
7 І ачысьціць сьвятар яго перад ГОСПАДАМ, і дараваны будзе яму праступак, якім саграшыў».
8 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
9 «Загадай Аарону і сынам ягоным, кажучы: “Вось закон адносна ахвяры цэласпаленьня.
Ахвяра цэласпаленьня будзе прыносіцца на вогнішчы на ахвярніку ўсю ноч аж да раніцы, і
агонь будзе гарэць на ахвярніку.
10 Сьвятар апранецца ў ільняную шату і льняную бялізну, і зьбярэ попел ахвяры цэла-
спаленьня, якую спаліў агонь на ахвярніку, і высыпе каля ахвярніку.
11 Потым здыме з сябе адзеньне сваё, а апране на цела другое адзеньне, і вынясе попел за табар
на чыстае месца.
12 Агонь жа на ахвярніку будзе гарэць заўсёды і ня будзе гаснуць. На ім сьвятар кожную раніцу
будзе паліць дровы, і будзе складаць ахвяру цэласпаленьня, і паліць на ім тлушч ахвяраў
мірных.
13 Агонь будзе заўсёды гарэць на ахвярніку і ніколі ня згасьне.
14 Гэта закон адносна ахвяраў хлебных. Сыны Аарона павінны прыносіць іх перад аблічча
ГОСПАДА перад ахвярнікам.
15 Сьвятар возьме жменю мукі, палітай алеем, з усім кадзілам, пакладзеным на муку, і спаліць
на ахвярніку на мілы пах як напамін ГОСПАДУ.
16 А рэшту мукі няхай зьядуць Аарон з сынамі сваімі, праснакі няхай яны ядуць на месцы
сьвятым, на панадворку Намёту Спатканьня.
17 Ня будзеце пекчы [хлеб] квашаны. Гэта частка, якую Я даю ім з Маіх ахвяраў агнявых. Гэта
сьвятое сьвятых, як і ахвяра за грэх, і ахвяра аднагараджэньня.
18 Толькі мужчыны з сыноў Аарона будуць есьці яе. Гэта закон вечны для пакаленьняў вашых
адносна ахвяраў цэласпаленьня ГОСПАДУ. Кожны, хто іх дакранецца, будзе асьвечаны”».
19 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
20 «Гэта вось ахвяра Аарона і сыноў ягоных, якую павінны яны складаць ГОСПАДУ ў дзень
іхняга памазаньня. Будуць яны складаць ахвяру штодзённую з дзясятай часткі эфы мукі
пшанічнай: палову яе раніцаю і палову — вечарам.
21 Яна павінна быць прыгатавана з алеем на патэльні. Прынясеш яе цёплую і ахвяруеш яе,
падзеленую на кавалкі, на мілы пах ГОСПАДУ.
22 Сьвятар, памазаны на месца бацькі свайго, зробіць гэта. Гэта закон вечны. Ахвяра цалкам
павінна быць спалена для ГОСПАДА.
23 Бо кожная ахвяра хлебная сьвятара будзе спалена агнём, і ніхто ня будзе есьці яе».
24 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:

25 «Скажы Аарону і сынам ягоным: “Такі вось закон адносна ахвяры за грэх. Ахвяра за грэх
павінна быць забітая перад абліччам ГОСПАДА на тым самым месцы, дзе забіваецца ахвяра
цэласпаленьня. Гэта справа сьвятая.
26 Сьвятар, які будзе складаць ахвяру за грэх, будзе яе есьці на месцы сьвятым, на панадворку
Намёту Спатканьня.
27 Кожны, хто дакранецца мяса яе, будзе асьвечаны. А калі кроўю яе будзе апырскана
адзеньне, апырсканае абмый на месцы сьвятым.
28 Калі тое мяса будзе варана ў пасудзіне глінянай, яе трэба разьбіць, а калі пасудзіна
мядзяная, яна павінна быць добра вышаравана і выпаласкана.
29 Кожны мужчына з роду сьвятарскага будзе есьці яе. Гэта сьвятое сьвятых.
30 А ўсякую ахвяру за грэх, кроў якой уносяць у Намёт Спатканьня для ачышчэньня ў Месцы
Сьвятым, ніхто няхай ня есьць, яна спальваецца ў агні.

Ляв 7

1 Вось закон адносна ахвяры аднагараджэньня. Гэта сьвятая рэч.
2 На тым самым месцы, дзе забіваецца ахвяра цэласпаленьня, будуць забіваць ахвяру
аднагараджэньня, і кроў яе выльюць вакол ахвярніка,
3 але ўвесь тлушч з яе будзе складзены ў ахвяру: курдзюк, тлушч, які пакрывае нутро,
4 абедзьве ныркі, а тлушч на вантробе разам з ныркамі няхай будзе аддзелены.
5 Спаліць гэта ўсё сьвятар на ахвярніку на мілы пах ГОСПАДУ. Гэта ахвяра аднагараджэньня.
6 Кожны мужчына з роду сьвятарскага будзе спажываць мяса гэтае на месцы сьвятым. Бо гэта
сьвятое сьвятых.
7 Для ахвяры за грэх і для ахвяры аднагараджэньня закон адзін. Яна належыць сьвятару, які
складаў гэтую ахвяру.
8 Сьвятар, які складае ахвяру цэласпаленьня, атрымоўвае скуру жывёлы, якую склаў у ахвяру.
9 Таксама кожная ахвяра хлебная, смажаная ў печы, у гаршчку або на патэльні, належыць
сьвятару, якім гэтая ахвяра складзена.
10 Але кожная ахвяра хлебная з алеем або сухая належыць усім сынам Аарона, як аднаму, так
і другому.
11 Вось закон адносна ахвяры мірнай, якую складаюць ГОСПАДУ.
12 Калі хто складае ахвяру гэтую як падзяку, няхай далучыць да гэтай ахвяры падзякі таксама
прэсныя аладкі з алеем, і прэсныя сухарыкі, запраўленыя алеем, і пшанічную муку з алеем.
13 Таксама няхай прыносіць аладкі з цеста квашанага пры ахвяры мірнай ў падзяку.
14 З усіх ахвяраў няхай адна будзе ахвяраваная як асаблівы дар ГОСПАДУ. Яна будзе належаць
сьвятару, які вылье кроў ахвяры мірнай.
15 Мяса ахвяраў мірных у падзяку мусіць быць зьедзена ў той самы дзень, нельга нічога з іх
пакідаць да раніцы.
16 Калі хто складае ахвяру як шлюбаваньне або з добрай волі, ахвяру ягоную трэба есьці ў дзень
ахвяраваньня, але і на другі дзень можна есьці рэшту яе.
17 Калі што застанецца на трэці дзень, тое трэба спаліць.
18 Калі хто зьесьць штосьці з ахвяры мірнай на трэці дзень, такая ахвяра ня будзе прынятая; ня
будзе яна залічана таму, хто яе склаў, бо гэта зьнявага; а той, хто будзе есьці яе, дапусьціцца
грэху.
19 Мяса, якое дакраналася чагосьці нячыстага, нельга есьці, але спальваецца яно ў агні; а мяса
чыстае можа есьці кожны чысты.
20 Калі нейкая душа, будучы ў нячыстасьці, будзе есьці мяса ахвяры мірнай, якая для ГОСПАДА,
будзе выключана душа гэтая з народу свайго.
21 Калі хто дакранецца нейкай нячыстасьці, нячыстасьці чалавечай, або нячыстасьці жывёлы,
або нячыстага паўзуна, і будзе есьці мяса ахвяры мірнай, якая для ГОСПАДА, той будзе
выключаны з народу свайго».
22 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
23 «Скажы сынам Ізраіля: “Нельга вам есьці тлушч цялят, авечак і казлоў.

24 Тлушчам зьвяроў мёртвых або разьдзёртых можна карыстацца ў кожнай патрэбе, але ня
ешце яго.
25 Калі хто будзе есьці тлушч жывёлаў, якіх прынесьлі на ахвяру агнявую для ГОСПАДА, той
будзе выключаны з народу свайго.
26 Дзе толькі будзеце жыць, нельга вам есьці ніякай крыві, ані крыві птушак, ані крыві быдла.
27 Кожная душа, якая будзе есьці кроў, будзе выключана душа гэтая з народу свайго”».
28 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
29 «Скажы сынам Ізраіля: “Хто складае ахвяру мірную для ГОСПАДА, няхай прынясе свой дар
ГОСПАДУ з ахвяры мірнай.
30 Сваімі рукамі няхай прынясе ён ахвяру агнявую для ГОСПАДА: тлушч з грудзіны і грудзіну,
каб трэсьці імі перад ГОСПАДАМ.
31 Тлушч спаліць сьвятар на ахвярніку, а грудзіна належыць Аарону і сынам ягоным.
32 Таксама правую лапатку аддасьцё сьвятару як частку сьвятарскую з ахвяраў мірных.
33 Які з сыноў Аарона складае ў ахвяру кроў і тлушч ахвяры мірнай, той як частку сваю атрымае
правую лапатку,
34 бо грудзіну патрасаную і лапатку ўздыманую Я бяру ад сыноў Ізраіля з іхніх ахвяраў мірных
і даю іх Аарону сьвятару і сынам ягоным як вечны закон ад усяго народу Ізраіля”».
35 Гэта ёсьць частка з ахвяраў, паленых для ГОСПАДА, якая належыць Аарону і сынам ягоным
ад дня пасьвячэньня іх на сьвятароў ГОСПАДА.
36 У дзень, калі іх ГОСПАД памазаў, загадаў Ізраілю даваць ім гэта. Гэта пастанова вечная ў
пакаленьні іхнія.
37 Гэта вось закон адносна ахвяры цэласпаленьня, ахвяры хлебнай, ахвяры за грэх, ахвяры
аднагараджэньня, ахвяры пасьвячэньня і ахвяры мірнай.
38 Гэта загадаў ГОСПАД Майсею на гары Сынай у дзень, калі загадаў сынам Ізраіля складаць
ахвяры ГОСПАДУ ў пустыні Сынай.

Ляв 8

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Вазьмі Аарона і сыноў ягоных, адзеньне, алей памазаньня, бычка на ахвяру за грэх, два
бараны і кош прэсных хлябоў.
3 Пасьля зьбяры ўсю грамаду каля ўваходу ў Намёт Спатканьня».
4 Майсей зрабіў так, як яму ГОСПАД загадаў, і грамада сабралася каля ўваходу ў Намёт
Спатканьня.
5 І сказаў Майсей грамадзе: «Вось слова, якое загадаў ГОСПАД выканаць!»
6 І прывёў Майсей Аарона і сыноў ягоных, і абмыў іх вадою.
7 І ўсклаў на яго шату льняную, і падперазаў яго паясом, і апрануў на яго верхнюю шату, і
наверх усклаў эфод, і апаясаў яго пасам эфоду, і прымацаваў на ім эфод.
8 І ўсклаў на яго нагруднік, на якім разьмясьціў урым і тумім,
9 і ўсклаў яму на галаву мітру і на ёй залатую дыядэму, сьвяты вянок, як загадаў Майсею
ГОСПАД.
10 Потым узяў Майсей алей памазаньня, і памазаў Сялібу разам з усім, што ў ёй было, і асьвяціў
гэта.
11 І пакрапіў ён ахвярнік сем разоў, і памазаў ахвярнік разам з яго прыналежнасьцямі, і
мыцельнік, і яго падставу, каб асьвяціць іх.
12 І паліў ім галаву Аарона, і памазаў яго, каб асьвяціць яго.
13 І наблізіў сыноў Аарона, і апрануў іх у шаты, і падперазаў іх паясамі, і ўсклаў на іх галовы
турбаны, як загадаў ГОСПАД Майсею.
14 І прывёў [Майсей] бычка ў ахвяру за грэх. І Аарон і сыны ягоныя ўсклалі рукі свае на галаву
ахвяры за грэх.
15 І Майсей забіў яго, і, узяўшы крыві яго, пальцам памазаў рагі ахвярніка кругом, і ачысьціў
ахвярнік. А рэшту крыві выліў на падставу ахвярніка, і асьвяціў яго, ачышчаючы яго.

16 І ўзяў ён увесь тлушч, які на нутры, і тлушч на вантробе, і абедзьве ныркі разам з тлушчам,
і спаліў іх на ахвярніку,
17 а бычка і скуру ягоную, і мяса ягонае, і нячыстасьці ягоныя спаліў у агні па-за табарам, як
загадаў ГОСПАД Майсею.
18 І прывёў [Майсей] барана ў ахвяру цэласпаленьня. І Аарон і сыны ягоныя ўсклалі на галаву
ягоную рукі свае.
19 І Майсей забіў яго, і пакрапіў кругом ахвярніка крывёю,
20 і пасек барана на часткі, і спаліў галаву, і кавалкі, і тлушч,
21 а нутро і ногі памыў вадой. І спаліў Майсей усяго барана ў агні на ахвярніку. Гэта
цэласпаленьне, мілы пах, ахвяра агнявая для ГОСПАДА, як загадаў ГОСПАД Майсею.
22 І прывялі другога барана, барана асьвячэньня. І Аарон і сыны ягоныя ўсклалі рукі свае на
галаву ягоную.
23 І Майсей забіў яго, і ўзяў крыві ягонай, і памазаў ёю верх правага вуха Аарона, вялікі палец
яго правай рукі і вялікі палец яго правай нагі.
24 І прывёў Майсей сыноў Аарона, і памазаў крывёй верх правага вуха іхняга, і вялікі палец
правай рукі іхняй, і вялікі палец правай нагі іхняй, і пакрапіў Майсей крывёю ахвярнік з усіх
бакоў.
25 Потым узяў тлушч, хвост і ўвесь тлушч, які на нутры, разам з тлушчам на вантробе, абедзьве
ныркі і іхні тлушч, і правую лапатку,
26 і з каша праснакоў, які стаяў перад абліччам ГОСПАДА, узяў адзін праснак, адну аладку на
алеі і адзін сухарык, і палажыў на тлушч і на правую лапатку.
27 І палажыў усё гэта на рукі Аарона і сыноў яго, і патрос гэтым перад абліччам ГОСПАДА.
28 І ўзяў усё гэта Майсей з рук іхніх, і спаліў на ахвярніку разам з цэласпаленьнем. Гэта ахвяра
асьвячэньня на мілы пах, ахвяра агнявая для ГОСПАДА.
29 І ўзяў Майсей грудзіну, і патрос яе перад абліччам ГОСПАДА. Гэта была частка Майсею з
барана ахвяры асьвячэньня, як загадаў ГОСПАД Майсею.
30 І ўзяў Майсей крыху алею памазаньня і крыху крыві з ахвярніка, і пакрапіў Аарона і шаты
ягоныя, а таксама сыноў ягоных і шаты іхнія. І асьвяціў Аарона і шаты ягоныя, а таксама сыноў
ягоных і шаты іхнія.
31 І сказаў Майсей Аарону і сынам ягоным: «Зварыце мяса каля ўваходу ў Намёт Спатканьня
і там ешце яго і хлеб, які ў кашы ахвяры асьвячэньня, як мне было загадана: “Аарон і сыны
ягоныя будуць есьці яго”.
32 А што застанецца з мяса і хлябоў, спаліце агнём.
33 Ад уваходу ў Намёт Спатканьня не адыходзьцеся сем дзён, аж да дня заканчэньня
асьвячэньня вашага, бо сем дзён будзе працягвацца асьвячэньне.
34 І што я зрабіў сёньня, так загадаў ГОСПАД рабіць, каб ачысьціць вас.
35 Каля ўваходу ў Намёт Спатканьня заставайцеся днём і ноччу сем дзён на варце ГОСПАДА,
каб не паўміралі, бо гэтак мне было загадана».
36 І зрабілі Аарон і сыны ягоныя ўсё, што загадаў ім ГОСПАД праз Майсея.

Ляв 9

1 У восьмы дзень паклікаў Майсей Аарона, сыноў ягоных і старшыняў Ізраіля і сказаў Аарону:
2 «Вазьмі са статку бычка ў ахвяру за грэх і барана ў ахвяру цэласпаленьня, абодвух без заганы,
і прынясі перад аблічча ГОСПАДА.
3 А сынам Ізраіля скажы: “Вазьміце казла ў ахвяру за грэх, і цяля, і барана аднагадовага без
заганы ў ахвяру цэласпаленьня,
4 і вала і барана ў ахвяру мірную, каб ахвяраваць іх перад абліччам ГОСПАДА, і ахвяру хлебную,
запраўленую алеем, бо сёньня ГОСПАД зьявіцца вам”».
5 І прынесьлі ўсё тое, што загадаў ім Майсей, да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і прыйшла ўся
грамада, і стала перад абліччам ГОСПАДА.
6 І сказаў Майсей: «Вось слова, якое загадаў ГОСПАД. Зрабіце [гэта], і зьявіцца вам слава
ГОСПАДА!»

7 І сказаў Майсей Аарону: «Наблізься да ахвярніка, і складзі ахвяру за грэх і ахвяру
цэласпаленьня, і ачысьці сябе і народ. І складзі ахвяру за народ, і ачысьці яго, як загадаў
ГОСПАД”.
8 І наблізіўся Аарон да ахвярніка, і забіў цяля за грэх свой.
9 І сыны ягоныя далі яму кроў цяляці, і ён, памачыўшы палец у крыві, памазаў ёю рагі
ахвярніку, а рэшту выліў на падставу ахвярніка.
10 Тлушч, ныркі і тлушч на вантробе з ахвяры за грэх спаліў ён на ахвярніку, як загадаў ГОСПАД
Майсею,
11 а мяса і скуру ягоную спаліў на агні па-за табарам.
12 І забіў ахвяру цэласпаленьня; і сыны ягоныя далі яму кроў, і ён выліў яе кругом ахвярніка.
13 Далі яму таксама ахвяру цэласпаленьня, падзеленую на часткі, і галаву яе, і ён спаліў гэта
на ахвярніку.
14 І абмыў ён нутро і ногі, і спаліў як цэласпаленьне на ахвярніку.
15 І склаў ён ахвяру за народ, і ўзяў казла, які быў прызначаны ў ахвяру за грэх народу, і забіў
яго, і ахвяраваў за грэх, як і першага.
16 І ўзяў ахвяру цэласпаленьня, і ахвяраваў яе паводле пастановы.
17 І прынёс ён ахвяру хлебную, і напоўніў ёю руку сваю, і спаліў на ахвярніку, апрача ранішняй
ахвяры цэласпаленьня.
18 І забіў вала і барана, ахвяры мірныя ад народу; і сыны ягоныя далі яму кроў, якую ён выліў
кругом ахвярніка.
19 А тлушч вала і хвост барана, і ныркі з лоем, і тлушч на вантробе
20 палажылі на грудзіну; і тлушч быў спалены на ахвярніку;
21 а грудзіну і правае плячо Аарон прынёс, патрасаючы перад абліччам ГОСПАДА, як загадаў
яму Майсей.
22 І падняў Аарон рукі ў бок народу, і дабраславіў яго, і, склаўшы ахвяры за грэх, ахвяры
цэласпаленьня і ахвяры мірныя, зыйшоў уніз.
23 І ўвайшлі Майсей і Аарон у Намёт Спатканьня і, выйшаўшы адтуль, дабраславілі народ. І
зьявілася слава ГОСПАДА ўсяму народу.
24 І выйшаў агонь ад аблічча ГОСПАДА, і спаліў ахвяру цэласпаленьня і тлушч, якія былі на
ахвярніку. І ўбачыў гэта ўвесь народ, і ўзрадаваліся, і ўпалі на абліччы свае.

Ляв 10

1 І ўзялі сыны Аарона, Надаў і Абігу, кожны кадзільніцу сваю, і набралі ў іх агонь, і паклалі на
яго кадзіла і ахвяравалі перад абліччам ГОСПАДА іншы агонь, а ня той, што быў ім загаданы.
2 І выйшаў агонь ад ГОСПАДА, і спаліў іх, і яны памерлі перад абліччам ГОСПАДА.
3 І сказаў Майсей Аарону: «Вось што сказаў ГОСПАД: “Я зьяўлю сьвятасьць Маю тым, якія
набліжаюцца да Мяне, і зьяўлю славу перад усім народам”». І замаўчаў Аарон.
4 І паклікаў Майсей Мішаэля і Эльцафана, сыноў Узіэля, дзядзькі Аарона, і сказаў ім: «Ідзіце і
забярыце братоў вашых, і вынясіце іх з Месца Сьвятога па-за табар».
5 І яны пайшлі, і забралі іх, што ляжалі ў шатах сваіх, і вынесьлі па-за табар, як ім было загадана
Майсеем.
6 І сказаў Майсей Аарону і Элеазару і Ітамару, сынам ягоным: «Не галіце валасоў вашых і
не разьдзірайце адзеньня, каб часам не былі вы пакараныя сьмерцю, і каб не ўзгарэўся гнеў
[Госпада] на ўсю грамаду. Але браты вашыя і ўвесь дом Ізраіля можа плакаць дзеля тых, якіх
спаліў ГОСПАД.
7 Вы ж не адыходзьце ад уваходу ў Намёт Спатканьня, бо загінеце, бо алей памазаньня
ГОСПАДА на вас». І яны зрабілі так, як Майсей загадаў ім.
8 І прамовіў ГОСПАД да Аарона, кажучы:
9 «Ня піце ані віна, ані сікеры ты і сыны твае, калі будзеце ўваходзіць у Намёт Спатканьня, і не
памрацё. Гэта пастанова вечная ў-ва ўсе пакаленьні вашыя,
10 каб вы маглі адрозьніваць паміж сьвятым і несьвятым, чыстым і нячыстым,
11 . і вучылі сыноў Ізраіля ўсім пастановам Маім, якія аб’явіў ГОСПАД ім праз Майсея».

12 І прамовіў Майсей да Аарона і пазасталых сыноў ягоных, Элеазара і Ітамара: «Вазьміце
ахвяру хлебную, якая засталася ад ахвяраў ГОСПАДАВЫХ, і ешце яе прэсную каля ахвярніка,
бо гэта сьвятое сьвятых.
13 Ешце яе ў месцы сьвятым, бо гэта частка твая і сыноў тваіх з ахвяраў агнявых для ГОСПАДА,
бо так мне загадана.
14 Грудзіну патрасаную і лапатку падыманую будзеце есьці на месцы чыстым ты і сыны твае,
і дочкі твае з табою, бо гэта частка твая і сыноў тваіх з ахвяраў мірных сыноў Ізраіля.
15 Лапатка падыманая і грудзіна патрасаная разам з часткамі тлустымі ахвяры цэласпаленьня,
якія будуць патрэсваць перад абліччам ГОСПАДА, будуць належаць табе і сынам тваім з табою
як пастанова вечная, як загадаў ГОСПАД».
16 І Майсей, шукаючы, шукаў казла ахвяры за грэх, і вось, ён спалены. І разгневаўся ён на
Элеазара і Ітамара, пазасталых сыноў Аарона, і сказаў ім:
17 «Чаму ня зьелі вы ахвяры за грэх у месцы сьвятым? Бо гэта сьвятое сьвятых. Яна дадзена
вам, каб зьняць правіны з грамады, каб ачысьціць яе перад абліччам ГОСПАДА.
18 Вось, кроў яе ня ўнесена ў Месца Сьвятое, а вы мусілі зьесьці яе ў Месцы Сьвятым, як загадана
мне».
19 І прамовіў Аарон да Майсея: «Вось, складзеная сёньня імі ахвяра за грэх і цэласпаленьне
перад абліччам ГОСПАДА, і такое здарылася. Калі сёньня зьем ахвяру за грэх, ці гэта будзе
добра ў вачах ГОСПАДА?”
20 І Майсей выслухаў гэта, і было гэта добра ў вачах ягоных.

Ляв 11

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы ім:
2 «Прамоўце да сыноў Ізраіля, кажучы: “Вось жывёлы з усіх жывёлаў зямных, якіх можаце
есьці.
3 Кожную жывёлу, у якой раздвоеныя капыты і глыбокі разрэз на капыце, і якая жуе жвайку,
можаце есьці.
4 Але з тых, якія маюць раздвоеныя капыты і якія жуюць жвайку, ня ешце вярблюда, бо ён жуе
жвайку, але ня мае раздвоеных капытоў, нячысты ён для вас;
5 дамана, бо ён жуе жвайку, але ня мае раздвоеных капытоў, нячысты ён для вас;
6 зайца, бо ён жуе жвайку, але ня мае раздвоеных капытоў, нячысты ён для вас;
7 і сьвіньню, бо яна мае раздвоеныя капыты і на капытах разрэз глыбокі, але не жуе жвайку,
нячыстая яна для вас.
8 Мяса іхняе ня ешце і падліны іхняй не дакранайцеся, бо яны нячыстыя для вас.
9 Гэта будзеце есьці з усяго, што ёсьць у вадзе: усё ў вадзе, што мае плаўнік і луску, ці ў моры,
ці ў рацэ, можаце есьці.
10 Але ўсё, што ня маеплаўніка і лускі, ці ў моры, ці ў рацэ, з усяго, што плавае ў вадзе, і з
усякай душы жывой, якая ў вадзе, агідныя яны для вас.
11 Яны будуць агідай для вас. Ня ешце мяса іхняга і высьцерагайцеся падліны іхняй.
12 Усе [жывёлы] ў вадзе, якія ня маюць плаўніка і лускі, будуць для вас агіднымі.
13 З птушак будзеце вы брыдзіцца, бо яны — агіда для вас, і ня будзеце есьці арла, грыфа і
марскога арла,
14 каршука і сокала з [усімі] гатункамі яго,
15 крумкачоў усякіх гатункаў яго,
16 страуса, савы, чайкі і ястрабаў усякіх гатункаў,
17 пугача, рыбалова, ібіса,
18 лебедзя, пэлікана і сыча,
19 чаплі, буслоў усякіх гатункаў, удода і кажана.
20 Усе жужлы крылатыя, якія на чатырох [нагах], агіднымі будуць для вас.
21 Але спаміж жужлаў крылатых, якія ходзяць на чатырох [нагах], будзеце есьці толькі тых, у
якіх галені вышэй за ногі, каб маглі скакаць па зямлі.

22 Спаміж іх ешце саранчу ўсіх гатункаў, салам усіх гатункаў, харголь усіх гатункаў і хагаб
усіх гатункаў.
23 Усе іншыя гатункі жужлаў крылатых, якія на чатырох [нагах], будуць для вас агідныя.
24 Ад іх вы будзеце нячыстыя; хто дакранецца падліны іхняй, будзе нячысты да вечара.
25 І кожны, хто будзе несьці падліну іхнюю, няхай вымые адзеньне сваё і будзе нячысты да
вечара.
26 Кожная жывёла, якая мае капыты раздвоеныя, але ня мае разрэзу і не жуе жвайку, будзе
нячыстая для вас. Кожны, хто дакранецца яе, станецца нячыстым.
27 З усіх жывёлаў, якія ходзяць на чтырох [нагах], тыя, што ходзяць на лапах, нячыстыя для
вас. Кожны, хто дакранецца падліны іхняй, нячысты будзе да вечара.
28 І той, хто нёс бы падліну іхнюю, няхай вымые адзеньне сваё і будзе нячысты да вечара, бо
яны нячыстыя для вас.
29 Спаміж малых жывёлін, якія рухаюцца па зямлі, нячыстыя крот, мыш і яшчаркі ўсіх
гатункаў,
30 анака, хамэлеон, летаа, хамэт і тыншамэт.
31 Усе яны нячыстыя спаміж малых жывёлаў. Кожны, хто дакранецца падліны іхняй, будзе
нячысты да вечара.
32 І ўсё, на што ўпадзе нейкая з іх нежывая, будзе нячыстым, усякі посуд драўляны, адзеньне,
скура, мяшок, усякая рэч, якою карыстаюцца. Трэба намачыць іх у вадзе, і будуць яны
нячыстыя аж да вечара, а потым будуць чыстыя.
33 А посуд гліняны, у які штосьці з гэтага ўпала, будзе ўнутры нячысты, і яго трэба разьбіць.
34 Кожная страва, якую ясьцё, калі на яе выцячэ вада [з таго посуду], будзе нячыстай, і ўсякае
пітво, якое п'юць з такога посуду, будзе нячыстае.
35 Усё, на што ўпадзе падліна іхняя, будзе нячыстым. Печ ці грубка маюць быць зьнішчаны, бо
яны нячыстыя, і будуць нячыстыя для вас.
36 Толькі крыніцы і студні, дзе ёсьць вада, будуць чыстымі. Але той, хто дакранецца падліны
іхняй, будзе нячысты.
37 Калі нешта ад падліны іхняй упадзе на насеньне, якое маюць сеяць, яно будзе чыстае.
38 Але калі зерне было мокрае, і ўпала на яго падліна іхняя, яно будзе для вас нячыстым.
39 Калі здохне жывёла, якую вам можна есьці, той, хто дакрануўся падліны яе, будзе нячысты
да вечара.
40 Калі хто зьесьць падліну тую, няхай памые адзеньне сваё і будзе нячысты да вечара. І той,
хто будзе несьці падліну тую, няхай вымые адзеньне сваё і будзе нячысты да вечара.
41 Усякая малая жывёліна, якая поўзае па зямлі — гэта брыдота, нельга яе есьці.
42 Усё, што поўзае па зямлі на жываце, і ўсё, што ходзіць на чатырох нагах, або мае шмат ног,
або цягнецца па зямлі, ня ешце гэтага, бо гэта брыдота.
43 Не паганьце душаў вашых усялякімі паўзунамі і не дакранайцеся да іх, каб ня сталіся
нячыстымі.
44 Бо Я — ГОСПАД, Бог ваш. Асьвячайцеся і будзьце сьвятымі, бо Я — Сьвяты! Не паганьце душаў
вашых нейкім паўзуном, які поўзае па зямлі,
45 бо Я — ГОСПАД, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, каб быць для вас Богам. Будзьце сьвятымі,
бо Я — Сьвяты!
46 Гэта вось закон адносна быдла і птушак і ўсякай душы жывой, якая жыве ў вадзе і поўзае па
зямлі,
47 каб вы адрозьнівалі, што чыстае, а што нячыстае, і [ведалі], што маеце есьці, а што нельга
есьці».

Ляв 12

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы: "Калі жанчына зачне і народзіць сына, сем дзён
застанецца нячыстай; як у дні месячніцы яна будзе нячыстай.
3 А ў восьмы дзень будзе абрэзана скуравінка [хлопца],

4 а яна трыццаць тры дні будзе ачышчацца ад крыві сваёй, ня будзе дакранацца нічога сьвятога,
і ня будзе ўваходзіць у сьвятыню, пакуль ня скончацца дні ачышчэньня ейнага.
5 Калі народзіць дачку, нячыстай будзе яна два тыдні як у [дні] месячніцы, і шэсьцьдзясят дзён
будзе ачышчацца ад крыві сваёй.
6 Калі скончацца дні ачышчэньня ейнага дзеля [нараджэньня] сына або дачкі, прынясе яна
аднагадовага барана ў ахвяру цэласпаленьня і маладога галубка або туркаўку ў ахвяру за грэх
да сьвятара да ўваходу ў Намёт Спатканьня.
7 І ён складзе іх у ахвяру перад абліччам ГОСПАДА, і ачысьціць яе, і так будзе яна ачышчаная
ад цячэньня крыві сваёй. Гэта закон адносна той, якая нарадзіла сына або дачку.
8 Калі б яна не змагла ахвяраваць барана, няхай ахвяруе двух туркавак або два маладыя
галубкі, аднаго ў ахвяру цэласпаленьня, а другога ў ахвяру за грэх, і ачысьціць яе сьвятар, і
яна будзе ачышчаная».

Ляв 13

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
2 «Калі ў чалавека на скуры цела ягонага зьявіцца пухліна, або лішай, або белая пляма, і
будзе на скуры цела ягонага хвароба праказы, няхай прывядуць яго да Аарона сьвятара, або
да аднаго з сыноў ягоных, сьвятароў.
3 І сьвятар агледзіць пляму на скуры, і калі валасы на пляме зьменяцца на белыя і пляма
паглыбіцца на скуры цела, гэта хвароба праказы. Сьвятар агледзіць яго і прызнае яго
нячыстым.
4 Але калі пляма на скуры цела яго белая, але ня ўглыбіўшыся ў цела, і валасы не пабялелыя,
сьвятар адасобніць яго на сем дзён.
5 У сёмы дзень сьвятар агледзіць яго. І вось, пляма не павялічылася і не пашырылася на скуры,
і адасобніць яго сьвятар яшчэ на сем дзён.
6 Пасьля сямі дзён сьвятар зноў агледзіць яго. І вось, пляма пацямнела і не пашырылася на
скуры, і сьвятар прызнае яго чыстым; гэта лішай, дык няхай ён вымые адзеньне сваё і будзе
чысты
7 А калі лішай пашырыўся па скуры пасьля таго, як ён стаў перад сьвятаром для праверкі, ён
другі раз павінен стаць перад сьвятаром.
8 І сьвятар агледзіць яго, і вось, лішай пашырыўся на скуры, і сьвятар прызнае яго нячыстым;
гэта праказа.
9 Калі на чалавеку выявіцца праказа, няхай прывядуць яго да сьвятара.
10 І сьвятар агледзіць яго, і вось, на скуры ягонай белая пухліна, і валасы [на ёй] белыя, і на
пухліне жывое мяса.
11 Гэта застарэлая праказа на скуры цела яго, і сьвятар прызнае яго нячыстым, і адасобніць
яго, бо ён нячысты.
12 Калі ж праказа расьцьвіце на скуры і пакрые ўсю скуру хворага ад галавы да ног, на колькі
могуць бачыць вочы сьвятара,
13 і ўбачыць сьвятар, што праказа пакрыла ўсё цела ягонае, ён прызнае хворага чыстым, таму
што ўсё [цела] перамянілася ў белае; ён чысты.
14 А ў дзень, калі выявіцца на ім жывое мяса, ён нячысты.
15 І ўбачыць сьвятар жывое мяса, і прызнае яго нячыстым; бо жывое мяса нячыстае; гэта
праказа.
16 А калі жывое мяса станецца зноў белым, няхай ён прыйдзе да сьвятара.
17 І сьвятар агледзіць яго, і вось, плямы сталіся белымі, і сьвятар прызнае яго чыстым; ён
чысты.
18 Калі ў каго на скуры цела была скула і зажыла,
19 але на месцы скулы будзе белая пухліна, або белая пляма, або чырвоная, ён павінен
паказацца сьвятару.
20 І сьвятар агледзіць яго і вось, тая пляма паглыблена адносна скуры і валасы на ёй
пабялеўшыя, і сьвятар прызнае яго нячыстым. Гэта хвароба праказы, якая зацьвіла на скуле.

21 А калі сьвятар убачыць, што вось, няма белых валасоў, і што пляма не паглыблена адносна
скуры, і што яна пацямнеўшы, сьвятар адасобніць яго на сем дзён.
22 І калі яна, пашыраючыся, пашырыцца на скуры, сьвятар прызнае яго нячыстым. Бо гэта
хвароба [праказы].
23 А калі пляма застанецца бяз зьмены і не пашырыцца, гэта шнар на скуле, і сьвятар прызнае
яго чыстым.
24 Калі хто мае на целе сваім апёк скуры, і калі на той скуры зьявіцца чырвоная або белая
пляма,
25 сьвятар агледзіць яго. І вось, валасы на пляме пабялеўшы, і пляма паглыблена адносна
скуры, гэта праказа, якая зацьвіла на апёку. І сьвятар прызнае яго нячыстым; гэта хвароба
праказы.
26 А калі сьвятар агледзіць яго, і вось, на пляме няма белых валасоў і яна не паглыблена
адносна скуры, і яна пацямнеўшы, тады сьвятар адасобніць яго на сем дзён.
27 У сёмы дзень сьвятар зноў агледзіць яго. Калі пляма, пашыраючыся, пашырылася на скуры,
сьвятар прызнае яго нячыстым. Гэта хвароба праказы.
28 А калі пляма не пашырыцца на скуры, але пацямнее, гэта шнар ад апёку. Сьвятар прызнае
яго чыстым, бо гэта шнар ад апёку.
29 Калі ў мужчыны або жанчыны на галаве або барадзе зьявіцца пляма,
30 няхай сьвятар агледзіць пляму, і калі яна паглыблена адносна скуры і валасы на ёй сталіся
жоўтыя і ценькія, сьвятар прызнае яго нячыстым. Гэта паршывасьць, праказа галавы або
барады.
31 А калі сьвятар агледзіць пляму паршывасьці, і вось, яна не паглыблена адносна скуры, і няма
чорных валасоў на ёй, сьвятар адасобніць хворага на паршывасьць на сем дзён.
32 У сёмы дзень сьвятар агледзіць пляму, і вось, паршывасьць не пашырылася і на ёй няма
жоўтых валасоў, і паршывасьць не паглыбілася адносна скуры.
33 Тады [чалавек] паголіцца, але не абголіць месца паршывасьці, і сьвятар зноў адасобніць яго
на сем дзён.
34 У сёмы дзень сьвятар агледзіць паршывасьць, і вось, паршывасьць не пашырылася і не
паглыбілася адносна скуры, і сьвятар прызнае яго чыстым, і ён памые адзеньне сваё, і будзе
чыстым.
35 А калі пасьля таго, як прызнаюць яго чыстым, пашыраючыся, пашырыцца паршывасьць на
скуры,
36 сьвятар агледзіць яго. І вось, паршывасьць пашырылася на скуры, і ўжо ня будзе сьвятар
шукаць жоўтых валасоў, бо [чалавек той] нячысты.
37 А калі ў вачах [сьвятара] застаецца паршывасьць [у сваім выглядзе], і вырас на ёй чорны
волас, паршывасьць вылекаваная, ён чысты, і сьвятар прызнае яго чыстым.
38 Калі ў мужчыны або жанчыны зьявіцца на скуры цела іхняга шмат плямаў белых,
39 няхай агледзіць іх сьвятар. І вось, на скуры цела іхняга шмат плямаў белых. Гэта крапіўка,
якая закрасавала на скуры; яны чыстыя.
40 Калі з чыёй галавы выпадуць валасы, ён лысы, і ён чысты.
41 і калі ў каго лоб палысее, ён лысы, і ён чысты.
42 Але калі на лысіне або палыселым чале зьявіцца пляма белая або чырвоная, гэта праказа,
якая закрасавала на лысіне або палыселым чале.
43 І сьвятар агледзіць яго, і вось, у яго пухліна белая або чырвоная на лысіне або палыселым
чале, падобная да праказы на скуры цела.
44 Гэта чалавек пракажоны, ён нячысты. Сьвятар прызнае яго нячыстым. У яго на галаве
хвароба ягоная.
45 Пракажоны, крануты гэтай хваробай, будзе мець разадранае адзеньне, нячэсаныя валасы
на галаве і бараду заслоненую, і будзе крычаць: “Нячысты, нячысты!”
46 Усе дні хваробы сваёй ён будзе нячыстым. Будзе жыць асобна, па-за табарам жытло ягонае.
47 Калі на нейкім адзеньні зьявіцца хвароба праказы, ці на адзеньні ваўняным, ці на ільняным,
48 ці на аснове, ці на ўтоку льняным, ці ваўняным, ці на скуры, ці на нейкім вырабе скураным,

49 і калі зьявіцца пляма зелянявая або чырвоная на адзеньні або на скуры, на ўтоку або аснове,
або на нейкім вырабе скураным, гэта хвароба праказы. Трэба паказаць гэта сьвятару.
50 Сьвятар агледзіць гэта і замкне [заражанае хваробай] на сем дзён.
51 У сёмы дзень агледзіць зноў хваробу, і калі яна пашырылася на адзеньні, або на аснове,
або на ўтоку, або на скуры, або на ўсім, што зроблена са скуры, гэта праказа ліхая; гэта [ўсё]
нячыстае.
52 І ён спаліць гэтае адзеньне, ці аснову, ці ўток ільняны, ці ваўняны, ці выраб скураны, на якіх
будзе гэтая хвароба, бо гэта праказа ліхая, яна павінна быць спалена агнём.
53 А калі сьвятар убачыць, што хвароба не пашырылася на адзеньні, або на аснове, або на ўтоку,
або на скураным вырабе,
54 тады сьвятар загадае вымыць рэч, на якой была хвароба, і замкне яе яшчэ на сем дзён.
55 І агледзіць яе сьвятар пасьля таго, як было вымытае [заражанае] хваробай, і вось, пляма не
зьмянілася ў вачах ягоных, і пляма не пашырылася. Гэта нячыстае, спаліш яго ў агні, ці [рэч]
заражаная з аднаго, ці з другога боку.
56 А калі сьвятар агледзіць яе, і вось, пасьля таго, як [рэч] была вымытая, пляма сталася
сьвятлейшай, ён аддзярэ гэтае [месца] ад адзеньня, або скуры, або асновы, або ўтоку.
57 А калі хвароба зноў зьявіцца на адзеньні, або на аснове, або на ўтоку, або на вырабе
скураным, і закрасуе, спаліш у агні тое, на чым ёсьць хвароба.
58 А тое адзеньне, або аснова, або ўток, або ўсякі выраб скураны, які ты вымыў і з якога зьнікла
хвароба, няхай будзе вымыты паўторна, і будзе ён чысты.
59 Гэта закон адносна хваробы праказы на адзеньні ваўняным ці льняным, або на аснове, або
на ўтоку, або на ўсялякім вырабе скураным, каб прызнаць іх чыстымі або нячыстымі».

Ляв 14

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Гэта закон адносна пракажонага ў дзень ачышчэньня ягонага. Няхай прывядуць яго да
сьвятара,
3 і сьвятар выйдзе па-за табар, і агледзіць яго сьвятар, і вось, хвароба праказы вылечаная ў
пракажонага.
4 І загадае сьвятар, каб за таго, які ачышчаны, узялі дзьве птушкі жывыя, чыстыя, і дрэва
кедровага, і ніткі кармазыновыя, і гізоп.
5 І сьвятар загадае забіць адну птушку над гліняным начыньнем, [напоўненым] вадой жывою.
6 І возьме другую жывую птушку разам з дрэвам кедровым, і ніткі кармазыновыя, і гізоп, і
ўмочыць іх і птушку жывую ў крыві [птушкі], забітай над вадою жывою,
7 і папырскае на ачышчанага ад праказы сем разоў, і прызнае яго чыстым. А птушку жывую
выпусьціць у поле.
8 Ачышчаны памые адзеньне сваё, абголіць усе валасы свае, і вымыецца ў вадзе, і будзе чысты.
Пасьля ачышчаны ўвойдзе ў табар і будзе жыць сем дзён па-за намётам сваім.
9 У сёмы дзень абголіць ён усе валасы свае, абголіць галаву і бараду, і бровы свае, вымые
адзеньне, абмые цела сваё вадой і будзе чысты.
10 У восьмы дзень возьме ён двух ягнятаў без заганы, адну авечку аднагадовую без заганы і
тры дзясятыя [эфы] пшанічнай мукі, зьмяшанай з алеем, як ахвяру хлебную, і адзін лог алею.
11 І сьвятар, які ачышчае, паставіць чалавека ачышчанага з усім гэтым перад абліччам
ГОСПАДА каля ўваходу ў Намёт Спатканьня.
12 І сьвятар возьме адно ягня, і складзе яго ў ахвяру аднагараджэньня, і [возьме] лог алею, і
прынясе ўсё гэта, патрэсваючы перад абліччам ГОСПАДА.
13 І заб'е ягня гэтае на месцы, на якім забіваюцца ахвяры за грэх і ахвяры цэласпаленьня, на
месцы сьвятым, бо ахвяра аднагараджэньня, як і ахвяра за грэх, [належыць] сьвятару; гэта
сьвятое сьвятых.
14 І возьме сьвятар кроў ахвяры аднагараджэньня, і памажа ёю верх правага вуха чалавека, які
ачышчаецца, а таксама вялікі палец яго правай рукі і вялікі палец яго правай нагі.
15 І возьме сьвятар лог алею, і вылье яго на [сваю] левую далонь.

16 І памочыць сьвятар палец правай рукі сваёй у алеі, які на яго левай далоні, і пакрапіць
пальцам, памочаным у алеі, сем разоў перад абліччам ГОСПАДА.
17 Рэштаю алею, што на далоні ягонай, сьвятар памажа верх правага вуха чалавека, які
ачышчаецца, а таксама вялікі палец яго правай рукі і вялікі палец яго правай нагі над крывёй
ахвяры аднагараджэньня.
18 А рэшту алею, якая на далоні сьвятара, вылье ён на галаву таго, хто ачышчаецца. Гэтак
перапросіць за яго сьвятар перад абліччам ГОСПАДА.
19 І складзе сьвятар ахвяру за грэх, і перапросіць за таго, хто ачышчаецца, за нячыстасьць
ягоную, і пасьля складзе ахвяру цэласпаленьня.
20 І складзе сьвятар ахвяру цэласпаленьня на ахвярніку разам з ахвярай хлебнай. І так сьвятар
ачысьціць таго [чалавека], і будзе ён чысты.
21 Калі ж хто бедны і няма ў руцэ ягонай дастатку, няхай возьме адно ягня ў ахвяру
аднагараджэньня для патрэсваньня, каб быць ачышчаным, а таксама дзясятую частку [эфы]
мукі, запраўленай алеем, у ахвяру хлебную, і лог алею,
22 і дзьве туркаўкі або два маладыя галубы, на што будзе здольная рука ягоная; адну птушку
ў ахвяру за грэх, а другую — на цэласпаленьне.
23 І прынясе іх на восьмы дзень ачышчэньня свайго да сьвятара да ўваходу ў Намёт Спатканьня
перад аблічча ГОСПАДА.
24 І сьвятар возьме ягня ў ахвяру аднагараджэньня і лог алею, і будзе патрэсваць патрэс-
ваньнем перад абліччам ГОСПАДА.
25 І заб'е ягня ў ахвяру аднагараджэньня, і возьме сьвятар кроў ахвяры аднагараджэньня, і
памажа верх правага вуха чалавека, які ачышчаецца, і вялікі палец яго правай рукі, і вялікі
палец яго правай нагі.
26 І налье сьвятар алей на левую далонь сваю,
27 і, памачыўшы ў ім палец правай рукі сваёй, пакрапіць сем разоў перад абліччам ГОСПАДА.
28 І сьвятар памажа алеем, які ў яго на далоні, верх правага вуха таго, хто ачышчаецца, а
таксама вялікі палец яго правай рукі і вялікі палец яго правай нагі ў месцы крыві ахвяры
аднагараджэньня.
29 А рэшту алею, што застаўся на левай руцэ яго, вылье сьвятар на галаву таго, хто ачышчаецца,
каб перапрасіць за яго перад абліччам ГОСПАДА.
30 І ахвяруе адну туркаўку або маладога галуба, якога прынясе рука таго, хто ачышчаецца,
31 і ахвяруе аднаго за грэх, а другога на цэласпаленьне разам з ахвярай хлебнай, і так
ачысьціць яго сьвятар перад абліччам ГОСПАДА.
32 Гэта закон адносна пракажонага, якому не стае [маёмасьці] ў руцэ ягонай дзеля
ачышчэньня свайго».
33 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
34 «Калі ўвойдзеце ў зямлю Ханаан, якую Я дам вам на ўласнасьць, і калі спашлю хваробу
праказы на нейкі дом у зямлі пасяленьня вашага,
35 няхай той, чый гэта дом, ідзе і паведаміць сьвятару, кажучы: "Хваробу я ўгледзеў у доме
[маім]".
36 І сьвятар загадае, каб прыбралі ўсё з дому, пакуль ён увойдзе ў яго, каб агледзець заразу,
каб яна не апаганіла ўсяго, што ў доме. І ўвойдзе сьвятар, каб агледзець дом.
37 І ён агледзіць хваробу тую, і вось, на сьценах хвароба дому, нібы ямінкі, зелянявыя ці
чырвоныя, што ўеліся ў сьцяну.
38 І выйдзе сьвятар з дому да дзьвярэй дому, і зачыніць дом на сем дзён.
39 У сёмы дзень вернецца сьвятар і агледзіць [дом]. І вось, пашырылася хвароба на сьцяне
дому.
40 І загадае сьвятар, і вырвуць тыя камяні заражаныя, і выкінуць іх за горад на месца нячыстае.
41 А дом кругом унутры абскрабуць, і тынк, які абскрэблі, выкінуць на месца нячыстае за
горадам.
42 І возьмуць іншыя камяні, і пакладуць на месца папярэдніх камянёў, і возьмуць іншую
заправу, і атынкуюць дом.

43 Калі ж зараза зноў закрасавала ў доме, хоць вырвалі камяні, а дом абскрэблі і атынкавалі,
44 прыйдзе сьвятар і агледзіць яго. І вось, зараза ў доме пашырылася, гэта ліхая праказа ў доме
гэтым, і ён нячысты.
45 І дом гэты зруйнуюць, а камяні, і дрэва, і ўвесь тынк дому таго выкінуць за горад у месца
нячыстае.
46 І калі нехта ўвойдзе ў дом, калі ён зачынены, будзе ён нячысты да вечара.
47 А калі нехта сьпіць у доме гэтым або есьць у доме гэтым, няхай памые адзеньне сваё.
48 А калі сьвятар прыйдзе, і агледзіць яго, і вось, зараза не пашырылася ў доме гэтым пасьля
атынкаваньня, сьвятар прызнае гэты дом чыстым, бо зараза была вылекавана.
49 І дзеля ачышчэньня дому сьвятар возьме дзьве птушкі, кавалак дрэва кедровага, ніткі
кармазыновыя і гізоп.
50 І заб'е адну птушку над пасудзінай глінянай над вадою жывою.
51 І возьме дрэва кедровае, гізоп, ніткі кармазыновыя і жывую птушку, памочыць іх у крыві
забітай птушкі і ў вадзе жывой, і пакрапіць сем разоў дом.
52 І ачысьціць дом той крывёй птушкі, і вадой жывой, і дрэвам кедровым, і ніткамі
кармазыновымі, і гізопам.
53 А жывую птушку пусьціць за горадам у полі. І перапросіць за дом гэты, і ён будзе чыстым.
54 Гэта закон адносна ўсякай заразы, праказы і паршывасьці,
55 праказы на адзеньні і ў доме,
56 пухліны, скулаў і белых плямаў,
57 каб навучыць, калі што чыстае, а калі нячыстае. Гэта закон адносна праказы».

Ляв 15

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
2 «Аб'явіце сынам Ізраіля і скажыце ім: "Мужчына, які мае выцёкі з цела свайго, нячысты.
3 Нячыстасьць яго ў выцёках ягоных, калі цела ягонае дапускае выцёк, ці калі затрымоўваецца
выцёк у целе; гэта нячыстасьць ягоная.
4 Кожны ложак, на якім ляжаў той, хто мае выцёкі, будзе нячысты, а таксама ўсякая рэч, на
якой ён сядзеў.
5 Кожны, хто дакранецца ложка ягонага, няхай памые адзеньне сваё, вымыецца ў вадзе, і будзе
нячысты да вечара.
6 Той, хто сеў на рэчы, на якіх сядзеў той, хто мае выцёкі, няхай памые адзеньне сваё,
вымыецца ў вадзе, і будзе нячысты да вечара.
7 Той, хто дакранецца цела чалавека, які мае выцёкі, няхай памые адзеньне сваё, вымыецца ў
вадзе, і будзе нячысты да вечара.
8 Калі той, хто мае выцёкі, плюне на [чалавека] чыстага, той няхай памые адзеньне сваё,
вымыецца ў вадзе, і будзе нячысты да вечара.
9 Кожнае сядло, на якім сядзеў [чалавек], што мае выцёкі, будзе нячыстае.
10 Кожны, хто дакранецца чаго-колечы, што той, хто мае выцёкі, меў пад сабою, будзе нячысты
аж да вечара. Кожны, хто пераносіць такія рэчы, няхай памые адзеньне сваё, вымыецца ў
вадзе, і будзе нячысты да вечара.
11 Кожны, да каго дакранецца той, хто мае выцёкі, не памыўшы перш рукі ў вадзе, няхай памые
адзеньне сваё, вымыецца ў вадзе, і будзе нячысты да вечара.
12 Кожны посуд гліняны, да якога дакранаецца той, хто мае выцёкі, няхай будзе пабіты, а
кожны посуд драўляны няхай будзе вымыты ў вадзе.
13 Калі той, хто мае выцёкі, паздаравее ад выцёкаў, тады няхай адлічыць сем дзён на
ачышчэньне сваё, і, памыўшы адзеньне сваё і цела сваё ў жывой вадзе, будзе чысты.
14 У восьмы дзень возьме дзьвюх туркавак або двух маладых галубоў, і пойдзе перад аблічча
ГОСПАДА да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і аддасьць іх сьвятару.
15 Сьвятар складзе іх у ахвяру: аднаго — у ахвяру за грэх, другога — у ахвяру цэласпаленьня, і
перапросіць за яго сьвятар перад абліччам ГОСПАДА за выцёкі ягоныя.

16 Калі ў каго выльецца насеньне, няхай ён абмые вадою ўсё цела сваё, і будзе нячысты да
вечара.
17 І ўсякае адзеньне, і ўсякую скуру, на якую выльецца насеньне, трэба вымыць вадою, і яны
будуць нячыстыя да вечара.
18 Калі мужчына ляжа з жанчынаю, і ў яго выльецца насеньне, няхай абодва абмыюцца ў вадзе,
і будуць нячыстыя да вечара.
19 Калі жанчына мае цячэньне крыві з цела свайго, і гэта месячніца, яна сем дзён будзе ў ня-
чыстасьці сваёй. Кожны, хто яе дакранецца, будзе нячысты да вечара,
20 і ўсё, на чым яна ляжала або сядзела ў дні нячыстасьці сваёй, будзе нячыстым.
21 Хто дакранецца ложка ейнага, няхай памые адзеньне сваё і вымыецца ў вадзе, і будзе
нячысты да вечара.
22 Кожны, хто дакранецца рэчаў, на якіх яна сядзела, няхай памые адзеньне сваё, вымыецца ў
вадзе, і будзе нячысты да вечара.
23 Калі хто дакранецца таго, што ляжала на ложку яе, або на рэчах, на якіх яна сядзела, будзе
нячысты да вечара.
24 Калі мужчына ляжа тады з ёю, нячыстасьць ейная будзе на ім, і ён будзе нячысты сем дзён.
Кожны ложак, на які ён ляжа, будзе нячысты.
25 Калі жанчына церпіць цячэньне крыві многія дні і ня ў час месячніцы, або калі пасьля
месячніцы кроў не спыняецца, яна нячыстая ўсе гэтыя дні; як доўга будзе мець нячыстасьць
сваю, будзе нячыстая.
26 Кожны ложак, на якім будзе ляжаць яна падчас цячэньня крыві сваёй, і рэчы, на якіх будзе
сядзець, будуць нячыстымі, як нячыстыя падчас месячніцы яе.
27 Хто дакранецца іх, будзе нячысты, няхай памые адзеньне сваё ў вадзе, і вымыецца ў вадзе,
і будзе нячысты да вечара.
28 Калі кроў спыніцца цячы, няхай яна адлічыць сем дзён, і потым будзе чыстая.
29 У восьмы дзень возьме яна за сябе дзьвюх туркавак або двух маладых галубоў і прынясе
сьвятару да ўваходу ў Намёт Спатканьня.
30 Сьвятар складзе аднаго ў ахвяру за грэх, а другога — на цэласпаленьне, і перапросіць за яе
сьвятар перад абліччам ГОСПАДА за цячэньне нячыстасьці яе.
31 Аддзяляйце сыноў Ізраіля ад нячыстасьці іхняй, каб яны не памерлі ў нячыстасьці сваёй,
паганячы Сялібу Маю, якая ёсьць сярод іх.
32 Гэта закон адносна таго, хто мае выцёкі насеньня і стаецца нячыстым,
33 і адносна жанчыны, якая мае месячніцу, і адносна мужчыны і жанчыны, якія маюць выцёкі,
і адносна мужчыны, які ляжа з жанчынай нячыстай”».

Ляв 16

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея пасьля сьмерці двух сыноў Аарона, калі яны прыйшлі перад
аблічча ГОСПАДА і памерлі,
2 і сказаў ГОСПАД Майсею: «Скажы Аарону, брату твайму, каб ня ў кожны час ён уваходзіў у
[Месца] Сьвятое за заслону перад накрыўкай, якая на Каўчэгу, каб ён не памёр, калі Я буду
аб’яўляцца ў воблаку над накрыўкай.
3 Вось, будзе ён уваходзіць у [Месца] Сьвятое, узяўшы маладое цяля ў ахвяру за грэх і барана
ў ахвяру цэласпаленьня.
4 І няхай апранецца ён у шату льняную сьвятую, і сподні льняныя будуць на целе ягоным,
і перапаяшацца паясом ільняным, а на галаву ўскладзе ільняны кідар; гэта шаты сьвятыя.
Няхай ён абмые цела сваё ў вадзе і апране іх.
5 І возьме ад грамады сыноў Ізраіля двух казлоў: аднаго — у ахвяру за грэх, а другога — у ахвяру
цэласпаленьня.
6 І Аарон прывядзе цяля ў ахвяру за грэх за сябе і перапросіць за сябе і за дом свой.
7 І возьме двух казлоў, і паставіць іх перад абліччам ГОСПАДА перад уваходам у Намёт
Спатканьня.

8 І кіне Аарон жэрабя на гэтых казлоў: адно жэрабя — для ГОСПАДА, а другое жэрабя — для
Азазэля.
9 І прывядзе Аарон таго казла, на якога выпала жэрабя для ГОСПАДА, і складзе яго ў ахвяру за
грэх,
10 а казла, на якога выпала жэрабя для Азазэля, паставіць жывога перад абліччам ГОСПАДА,
каб выканаць перамаленьне і каб выгнаць яго для Азазэля ў пустыню.
11 І прывядзе Аарон цяля ў ахвяру за грэх за сябе і на перамаленьне за сябе і за свой дом, і заб'е
цяля ў ахвяру за грэх за сябе.
12 І возьме поўную кадзільніцу напаленых вуглёў з ахвярніка, які перад абліччам ГОСПАДА, і
поўныя жмені пахкага тоўчанага кадзіла, і занясе за заслону;
13 і кіне кадзіла на агонь перад абліччам ГОСПАДА. Воблака кадзіла закрые накрыўку, якая над
Каўчэгам Сьведчаньня, і ён не памрэ.
14 І возьме крыві цяляці, і пакрапіць пальцам сваім перад накрыўкай з усходу. Сем разоў
пакрапіць перад накрыўкай пальцам, змочаным у крыві.
15 І заб'е казла за грэх народу, і ўнясе кроў яго за заслону, і зробіць з крывёй яго тое самае, што
зрабіў з крывёй цяляці, і пакрапіць ёю накрыўку зьверху і сьпераду,
16 і перапросіць за [Месца] Сьвятое, за нячыстасьць сыноў Ізраіля і за злачынствы іх паводле
ўсіх грахоў іхніх. Гэтак сама зробіць ён з Намётам Спатканьня, які знаходзіцца ў іх сярод
нячыстасьці іхняй.
17 Ніводзін чалавек не павінен быць у Намёце Спатканьня, калі Аарон увойдзе, каб выканаць
перамаленьне ў [Месцы] Сьвятым, аж пакуль ён ня выйдзе. І ён перапросіць за сябе, за дом
свой і за ўсю царкву Ізраіля.
18 І выйдзе да ахвярніка, які перад абліччам ГОСПАДА, і ўчыніць перамольваньне над ім, і
возьме крыві бычка і крыві казла, і памажа ёю рогі ахвярніка з усіх бакоў,
19 і пакропіць сем разоў яго пальцам, умочаным у крыві, і ачысьціць яго ад нячыстасьці сыноў
Ізраіля, і асьвяціць яго.
20 І скончыць перамольваньне над [Месцам] Сьвятым, Намётам Спатканьня і ахвярнікам, і
прывядзе жывога казла.
21 І ўскладзе Аарон абедзьве рукі свае на галаву жывога казла, і выкажа над ім усе правіны
сыноў Ізраіля, усе злачынствы іхнія і ўсе грахі іхнія, і ўзложыць іх на галаву казла, і выганіць
яго праз прызначанага чалавека ў пустыню.
22 І панясе казёл з сабой усе правіны іхнія ў зямлю бязьлюдную, і выганіць ён казла ў пустыню.
23 І Аарон увойдзе ў Намёт Спатканьня, здыме шаты льняныя, якія апрануў, уваходзячы ў
[Месца] Сьвятое, і пакладзе іх там.
24 І абмые цела вадою ў месцы сьвятым, і апране адзеньне сваё, і выйдзе, і складзе ахвяру
цэласпаленьня за сябе і за народ, і перапросіць за сябе і за народ.
25 І тлушч ахвяры за грэх спаліць на ахвярніку.
26 А [чалавек], які выгнаў казла для Азазэля, памые адзеньне сваё, абмые цела сваё ў вадзе, і
вернецца ў табар.
27 А бычка ахвяры за грэх і казла ахвяры за грэх, кроў якіх унесена была для перамаленьня за
[Месца] Сьвятое, вынясуць па-за табар і спаляць разам са скураю, мясам і нячыстасьцю іхняй.
28 Той, хто спаліць іх, памые адзеньне сваё і абмые цела сваё ў вадзе, і вернецца ў табар.
29 Гэта будзе для вас пастановай вечнай. У сёмы месяц, у дзясяты дзень месяца прыгня-
тайце душы вашыя пакутаю, не выконвайце ніякай працы ані тутэйшы, ані прыхадзень, які
паселіцца паміж вамі.
30 У той дзень будзе перамаленьне за вас дзеля ачышчэньня ад усіх грахоў вашых, каб былі вы
чыстымі перад абліччам ГОСПАДА.
31 Гэта для вас супачынак супачынку, прыгнятайце душы вашыя. Гэта пастанова вечная.
32 І будзе перамольваць сьвятар, які быў памазаны і пасьвячоны на сьвятарства на месца бацькі
свайго. І ўскладзе ён на сябе шаты льняныя, шаты сьвятыя,
33 і ўчыніць перамольваньне за Сьвятое Сьвятых і Намёт Спатканьня, ахвярнік, і за сьвятароў
і за ўвесь народ царквы.

34 Гэта будзе для вас пастанова вечная, каб раз у год перамольваць за сыноў Ізраіля за ўсе грахі
іхнія». І зрабіў ён, як загадаў ГОСПАД Майсею.

Ляв 17

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да Аарона, і да сыноў ягоных, і да ўсіх сыноў Ізраіля, і скажы ім: “Гэта слова, якое
загадаў ГОСПАД.
3 Калі хто з дому Ізраіля заб’е вала, або авечку, або казу ў табары або па-за табарам
4 і не прывядзе іх да ўваходу ў Намёт Спатканьня, каб скласьці ў ахвяру ГОСПАДУ перад сялібай
ГОСПАДА, будзе вінен крыві. Ён праліў кроў, і будзе выключаны той чалавек з народу свайго.
5 Дзеля таго сыны Ізраіля будуць прыводзіць ахвяры свае, якія дасюль складалі ў полі, да
ГОСПАДА да ўваходу ў Намёт Спатканьня, да сьвятара, і будуць складаць іх як ахвяры мірныя
для ГОСПАДА.
6 І пакропіць сьвятар крывёй ахвярнік ГОСПАДА пры ўваходзе ў Намёт Спатканьня, а тлушч
спаліць на мілы пах ГОСПАДУ.
7 Ужо ня будуць складаць ахвяраў для казлоў, з якімі распусьнічалі. Гэта будзе ім пастанова
вечная для пакаленьняў іхніх”.
8 І скажаш ім: “Калі хто з дому Ізраіля або з прыхадняў, якія жывуць сярод вас, будзе складаць
ахвяру цэласпаленьня або [іншую] ахвяру
9 і не прывядзе яе да ўваходу ў Намёт Спатканьня, каб ахвяраваць ГОСПАДУ, будзе чалавек той
выключаны з народу свайго.
10 Калі хто з дому Ізраіля або з прыхадняў, якія жывуць сярод вас, будзе есьці кроў, Я скірую
аблічча Маё супраць душы, якая есьць кроў, і вынішчу яе спаміж народу яе.
11 Бо душа цела ў крыві, і Я даў яе вам, каб на ахвярніку перамольвалі ёю за душы вашыя, бо
кроў перамольвае за душу.
12 Дзеля таго Я сказаў сынам Ізраіля: "Ніхто з вас ня будзе спажываць крыві". І прыхадзень,
які жыве сярод вас, ня будзе спажываць крыві.
13 Калі хто з сыноў Ізраіля або з прыхадняў, якія жывуць сярод вас, упалюе дзікага зьвера або
птушку, якіх можна есьці, няхай вылье з іх кроў і закрые яе пылам [зямлі].
14 Бо душа кожнага цела ў крыві ягонай; і Я сказаў сынам Ізраіля: "Не спажывайце крыві
ніводнага цела, бо душа кожнага цела ў крыві ягонай. Кожны, хто будзе спажываць яе, будзе
вынішчаны".
15 Кожны тутэйшы або прыхадзень, які будзе есьці мяса падліны або разьдзёртай [жывёлы],
няхай памые адзеньне і вымыецца ў вадзе, і будзе ён нячысты да вечара, а [пасьля] станецца
чыстым.
16 Калі ж хто не памые адзеньня і ня вымые цела свайго, будзе насіць правіну сваю”».

Ляв 18

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Я — ГОСПАД, Бог ваш.
3 Не рабіце паводле звычаю зямлі Эгіпецкай, у якой вы жылі. І паводле звычаю зямлі Ханаан,
у якую Я ўвяду вас, не рабіце, і не хадзіце паводле пастановаў іхніх.
4 Будзеце спаўняць прысуды Мае і пастановы Мае, захоўваць і хадзіць паводле іх. Я — ГОСПАД,
Бог ваш.
5 Захоўвайце пастановы Мае і прысуды Мае. Выконваючы іх, чалавек будзе жыць дзякуючы ім.
Я — ГОСПАД!
6 Ніхто ня можа набліжацца да сваяка, каб адкрыць голасьць ягоную. Я — ГОСПАД.
7 Не адкрывай голасьці бацькі твайго і маці тваёй, бо гэта — маці твая, не адкрывай голасьць
ейную.
8 Не адкрывай голасьці жонкі бацькі твайго, бо гэта голасьць бацькі твайго.
9 Не адкрывай голасьці сястры тваёй, дачкі бацькі твайго або дачкі маці тваёй, ці яна
нарадзілася ў доме, ці па-за домам. Не адкрывай голасьці іх.

10 Не адкрывай голасьці дачкі сына твайго або дачкі дачкі тваёй, бо гэта голасьць твая.
11 Не адкрывай голасьці дачкі жонкі бацькі твайго, народжанай ад бацькі твайго; гэта сястра твая, не адкрывай голасьці яе.
12 Не адкрывай голасьці сястры бацькі твайго, бо яна сваячка бацькі твайго.
13 Не адкрывай голасьць сястры маці тваёй, бо яна сваячка маці тваёй.
14 Не адкрывай голасьці брата бацькі твайго, ня ўваходзь да жонкі ягонай, бо гэта цётка твая.
15 Не адкрывай голасьці нявесткі тваёй, бо яна жонка сына твайго, не адкрывай голасьці яе.
16 Не адкрывай голасьці жонкі брата твайго, бо гэта голасьць брата твайго.
17 Не адкрывай голасьці жанчыны і дачкі яе. Не бяры дачкі сына ейнага ані дачкі дачкі ейнай, каб адкрыць голасьць яе, бо яны — сваячкі яе. Гэта брыдота.
18 Не бяры жанчыны разам з сястрой яе, каб не зрабіць яе суперніцай, адкрываючы голасьць яе за жыцьця гэтай.
19 Не набліжайся да жанчыны ў час месячніцы, каб адкрыць голасьць яе.
20 Не ўваходзь да жонкі бліжняга твайго, выліваючы насеньне; праз гэта [станешся] ты нячысты.
21 Не аддавай дзіцяці твайго, каб прывесьці да Малоха, і ня будзеш паганіць імя Бога твайго. Я — ГОСПАД.
22 Не ляжы з мужчынам так, як ляжаць з жанчынаю. Гэта агіда.
23 Не лажыся ні з якою жывёлаю, бо праз гэта [станешся] нячысты. І жанчына ня стане перад жывёлаю, каб злучыцца з ёю, бо гэта вычварэньне.
24 Не паганьцеся ўсім гэтым, бо ўсім гэтым апаганілі сябе народы, якія Я выганю перад вамі.
25 І апаганілася зямля, і Я пакараў [яе] за беззаконьні ейныя, і выкінула яна з сябе жыхароў сваіх.
26 Дык вы захоўвайце пастановы Мае і прысуды Мае, і не дапускайцеся ўсіх гэтых брыдотаў, ані тутэйшыя, ані прыхадні, якія жывуць сярод вас,
27 бо ўсіх гэтых брыдотаў дапускаліся жыхары зямлі, якія былі перад вамі, і апаганілася зямля.
28 [Сьцеражыцеся], каб і вас гэтая зямля ня выкінула, калі будзеце паганіць яе, як яна выкінула з сябе народ, які быў перад вамі.
29 Бо кожны [чалавек], які ўчыніць адну з гэтых брыдотаў, будзе вынішчаны спасярод народу свайго.
30 Захоўвайце загады Мае. Не дапускайцеся брыдотных звычаяў, як дапускаліся тыя, што былі перад вамі, і не паганьцеся імі. Я — ГОСПАД, Бог ваш”».

Ляв 19

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да ўсёй грамады сыноў Ізраіля і скажы ім: “Будзьце сьвятымі, бо сьвяты Я, ГОСПАД, Бог ваш.
3 Няхай кожны баіцца маці сваю і бацьку свайго. І захоўвайце суботы Мае. Я — ГОСПАД, Бог ваш!
4 Не зьвяртайцеся да ідалаў і не вылівайце сабе багоў з мэталю. Я — ГОСПАД, Бог ваш!
5 Калі будзеце складаць ГОСПАДУ ахвяру мірную, складайце так, каб была яна Яму прыемнай.
6 Будзеце есьці яе ў сам дзень ахвяры вашай і ў наступны дзень. Тое, што застанецца на трэці дзень, будзе спалена агнём.
7 Калі хто гэта будзе есьці на трэці дзень, паганым гэта будзе і ня будзе прыемным [Госпаду].
8 Хто будзе яе есьці, учыніць беззаконьне, бо спаганіў сьвятасьць ГОСПАДА, і зьнішчана будзе душа тая спасярод народу свайго.
9 Калі будзеце жаць збожжа зямлі вашай, не выжынай аж да канца поля і не зьбірай каласоў, што засталіся.
10 Не абірай вінаградніка твайго да рэшты і ягадаў, што пападалі ў вінаградніку, не падбірай; пакінь гэта бедным і прыхадням. Я — ГОСПАД, Бог ваш!
11 Не крадзіце, і не хлусіце, і не ашуквайце адзін аднаго.
12 Не прысягайце на імя Маё дзеля хлусьні, і не зьневажай імя Бога твайго. Я — ГОСПАД!

13 Не прыгнятай бліжняга твайго і ня крыўдзі яго. І няхай не застаецца ў цябе плата найміта
аж да раніцы.
14 Не праклінай глухога і перад сьляпым не кладзі перашкоды, але бойся Бога твайго. Я —
ГОСПАД!
15 Не дапускайцеся несправядлівасьці на судзе. Не пагарджай бедным і не патурай багатаму.
Праведна судзі бліжняга твайго.
16 Ня будзь паклёпнікам у народзе сваім. Не цікуй на кроў бліжняга твайго. Я — ГОСПАД!
17 Ня мей у сэрцы тваім нянавісьці да брата твайго. Дакараючы, дакарай бліжняга твайго, і ня
будзеш мець грэху з прычыны яго.
18 Ня помсьці і не насі крыўду на сыноў народу твайго. Любі бліжняга твайго як самога сябе.
Я — ГОСПАД!
19 Захоўвай пастановы Мае. Жывёлы тваёй не лучы з жывёлай другой пароды; поля твайго не
засявай двума гатункамі [насеньня]. Не апранай адзеньня з двух матэрыялаў.
20 Калі хто ўвойдзе да жанчыны, выліваючы насеньне, а яна ёсьць нявольніцай, прызначанай
для [іншага] мужа, але яшчэ ня выкуплена і не надзелена свабодай, абодва будуць пакараныя,
але не карай сьмерцю, бо не была яна свабоднай.
21 І ён складзе ахвяру аднагараджэньня ГОСПАДУ каля ўваходу ў Намёт Спатканьня, барана ў
ахвяру аднагараджэньня.
22 І перапросіць за яго сьвятар бараном ахвяры аднагараджэньня за грэх ягоны, якім саграшыў
перад абліччам ГОСПАДА, і будзе адпушчаны яму грэх, якім саграшыў.
23 Калі прыйдзеце вы ў зямлю і пасадзіце дрэвы пладовыя ўсякіх гатункаў, будзеце ўважаць
плады іхнія за неабрэзаныя; тры гады будуць яны для вас неабрэзаныя, і нельга іх есьці.
24 У чацьвёртым годзе ўсе плады іхнія будуць пасьвячоныя як дар для ГОСПАДА.
25 А ў пяты год будзеце есьці плады іхнія, каб павялічыўся для вас ураджай з іх. Я — ГОСПАД,
Бог ваш!
26 Ня ешце нічога з крывёй. Не варажыце і не займайцеся чараваньнем.
27 Не стрыжы валасоў кругом галавы, і не калеч край барады сваёй.
28 Не рабіце нарэзы на целе вашым [на знак жалобы] па памерлых і не наколвайце надпісы на
скуры. Я — ГОСПАД!
29 Не выдавай на ганьбу дачку тваю, робячы з яе распусьніцу, каб не апаганілася зямля і не
напоўнілася распустай.
30 Захоўвайце суботы Мае і шануйце сьвятыню Маю. Я — ГОСПАД!
31 Не зьвяртайцеся ані да тых, што выклікаюць духаў [памерлых], ані да варажбітоў, каб у іх
раіцца, каб праз іх не апаганіліся. Я — ГОСПАД, Бог ваш!
32 Перад сівой галавой устань, і шануй аблічча старога, і бойся Бога твайго. Я — ГОСПАД.
33 Калі ў зямлі вашай паселіцца прыхадзень, ня крыўдзі яго,
34 але няхай будзе ён пасярод вас як тутэйшы, і любі яго як самога сябе, бо і вы былі
прыхаднямі ў зямлі Эгіпецкай. Я — ГОСПАД, Бог ваш!
35 Не дапускайцеся несправядлівасьці на судзе, у меры, у вазе і ў вымярэньнях.
36 Няхай будуць у вас вагі праведныя, эфа праведная і гін праведны. Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які
вывеў вас з зямлі Эгіпецкай.
37 І вы будзеце захоўваць усе пастановы Мае і ўсе пысуды Мае, і выконваць іх. Я — ГОСПАД”».

Ляв 20

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Кажы сынам Ізраіля: “Калі нехта з сыноў Ізраіля або з сыноў прыхадняў, якія пасяліліся ў
Ізраілі, дасьць адно з дзяцей сваіх Малоху, сьмерцю памрэ; землякі ягоныя ўкамянуюць яго.
3 І Я Сам зьвярну аблічча Маё супраць яго, і выкараню яго спаміж народу яго за тое, што ён даў
насеньне сваё Малоху, спаганіў сьвятыню Маю і зьняважыў сьвятое імя Маё.
4 Калі землякі ягоныя закрыюць вочы свае на такога чалавека, які аддаў адно з дзяцей сваіх
Малоху, і не заб’юць яго,

5 Я Сам зьвярну аблічча Маё супраць такога чалавека і супраць сям'і ягонай, і выкараню яго
спасярод народу яго, а таксама ўсіх тых, якія насьлядуюць яго, якія распусьнічаюць з Малохам.
6 І супраць душы, якая зьвернецца да тых, што выклікаюць духаў [памерлых], або да
варажбітоў, каб распусьнічаць з імі, Я зьвярну аблічча Маё, і выкараню яго спаміж народу яго.
7 Дык асьвяціцеся і будзьце сьвятыя, бо Я — ГОСПАД, Бог ваш!
8 Захоўвайце пастановы Мае і выконвайце іх. Я — ГОСПАД, Які асьвячае вас!
9 Хто праклінае бацьку свайго і маці сваю, сьмерцю памрэ; хто праклінаў бацьку свайго і маці
сваю, кроў ягоная [будзе] на ім.
10 Калі хто будзе чужаложыць з жонкай бліжняга свайго, сьмерцю памрэ і чужаложнік, і
чужаложніца.
11 Хто ляжа з жонкаю бацькі свайго, той адкрывае голасьць бацькі свайго; сьмерцю памруць
абое, кроў іхняя [будзе] на іх.
12 Хто ляжа з нявесткай сваёй, сьмерцю памруць абое. Яны дапусьціліся брыдоты, і кроў іхняя
[будзе] на іх.
13 Хто ляжа з мужчынам так, як з жанчынай, робіць вычварэньне. Абодва сьмерцю памруць;
кроў іхняя [будзе] на іх.
14 Калі хто бярэ за жонку жанчыну і маці ейную, дапускаецца распусты; ён і яна будуць
спалены ў агні, каб не было распусты сярод вас.
15 Хто ляжа з жывёлай, выліваючы [насеньне], сьмерцю памрэ. Жывёлу таксама трэба забіць.
16 Калі жанчына наблізіцца да якой жывёлы, каб злучыцца з ёй, заб'еш і жанчыну, і жывёлу.
[Абое] сьмерцю памруць; кроў іхняя [будзе] на іх.
17 Калі хто возьме сястру сваю, дачку бацькі свайго або дачку маці сваёй, і будзе аглядаць
голасьць яе, а яна будзе аглядаць голасьць яго, гэта сорам; няхай будуць забітыя перад вачыма
сыноў народу свайго; ён адкрыў голасьць сястры сваёй, беззаконьня ён дапусьціўся.
18 Калі хто ляжа з жанчынай у час месячніцы і адкрые голасьць яе, ён адкрывае крыніцу
[крыві], і яна таксама адкрывае крыніцу крыві сваёй; абодва вынішчаны будуць спасярод
народу свайго.
19 Не адкрывай голасьці сястры маці тваёй або сястры бацькі твайго, бо выяўляеш голасьць
сваячкі сваёй. Беззаконьне сваё яны панясуць.
20 Хто ляжа з цёткай сваёй, той адкрывае голасьць дзядзькі свайго. Яны панясуць грэх свой,
памруць бязьдзетныя.
21 Хто бярэ жонку брата свайго, гэта паскудства. Ён адкрыў голасьць брата свайго, будуць яны
бязьдзетныя.
22 Захоўвайце ўсе пастановы Мае і ўсе прысуды Мае і выконвайце іх, каб ня выкінула вас зямля,
у якую Я ўвяду вас, каб вы жылі ў ёй.
23 Не хадзіце паводле звычаяў народаў, якія Я выганю перад вамі. Бо ўсяго гэтага дапускаліся
яны, і яны сталіся для Мяне брыдкімі.
24 І Я сказаў вам: "Вы ўспадкаеміце зямлю іхнюю, і Я дам яе вам на ўласнасьць, зямлю, якая
ацякае малаком і мёдам. Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які аддзяліў вас ад [іншых] народаў".
25 Дык адрозьнівайце жывёлу чыстую ад нячыстай і птушку чыстую ад нячыстай, каб не
апаганілі вы душаў вашых жывёлай, і птушкамі, і ўсім, што рухаецца па зямлі, і што Я вылучыў
вам як нячыстае.
26 Будзьце для Мяне сьвятымі, бо сьвяты Я, ГОСПАД, Які аддзяліў вас ад [іншых] народаў, каб
вы былі Маімі.
27 Мужчына або жанчына, калі будуць яны выклікаць духаў [памерлых] або варажыць,
сьмерцю памруць. Укамянуеце іх камянямі; кроў іхняя [будзе] на іх"».

Ляв 21

1 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Гавары сьвятарам, сынам Аарона, і кажы ім: "Няхай не
занечышчаецца сьвятар, дакранаючыся памёршага з народу свайго.

2 Толькі да блізкіх сваякоў, да бацькі свайго і маці сваёй, сына свайго і дачкі сваёй, і брата свайго,
3 і сястры сваёй, дзяўчыны, што жыве пры ім незамужняя, можна яму [дакранацца і] занячысьціць сябе.
4 І няхай не занячысьціць сябе сьвятар з прычыны сваякоў жонкі сваёй, бо было б гэта зьнявагаю.
5 Ня будуць яны стрыгчы галавы сваёй і ня будуць галіць краёў барады, і на целе сваім ня будуць рабіць нарэзаў.
6 Сьвятымі будуць яны перад Богам сваім і ня будуць паганіць імя Бога свайго, бо яны складаюць ахвяры агнявыя ГОСПАДУ, хлеб Богу свайму, таму мусяць яны быць сьвятымі.
7 Ня возьмуць яны за жонку распусьніцы або зьняслаўленай; ня возьмуць жанчыны, выгнанай мужам, бо яны пасьвячоныя для Бога свайго.
8 Будзеш уважаць яго за асьвячонага, бо ён складае хлеб Богу твайму. Няхай будзе ён сьвяты для цябе, бо сьвяты Я, ГОСПАД, Які асьвячае вас.
9 Калі дачка сьвятара паганіць сябе распустаю і няславіць імя бацькі свайго, будзе яна спалена ў агні.
10 Сьвятар вялікі паміж братоў сваіх, галава якога была памазана алеем, і рукі якога напоўненыя [на сьвятарства], і які апрануты ў шаты сьвятыя, ня будзе распускаць валасоў сваіх і разьдзіраць шатаў сваіх,
11 і ня будзе ён набліжацца да ніводнага памёршага, ня можа ён занячысьціцца [нават] з прычыны бацькі свайго і маці.
12 Ня будзе ён выходзіць са сьвятыні і не апаганіць сьвятыню Бога свайго, бо ён памазаны алеем памазаньня для Бога свайго. Я — ГОСПАД.
13 За жонку возьме ён толькі дзяўчыну.
14 Ня возьме за жонку ані ўдавы, ані разьведзенай, ані зьняслаўленай, ані распусьніцы, але возьме за жонку дзяўчыну спасярод народу свайго.
15 І не зьняславіць ён насеньня свайго сярод народу свайго, бо Я — ГОСПАД, Які асьвячаю яго”».
16 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
17 «Прамоў да Аарона, кажучы: “Ніхто з насеньня твайго ў пакаленьнях іхніх, у якога на целе будзе загана, не павінен набліжацца, каб складаць ахвяру для Бога свайго.
18 Ніхто, у каго на целе загана, не павінен набліжацца, ані сьляпы, ані кульгавы, ані той, хто мае скалечаны твар, ані някшталтны,
19 ані той, хто мае зламаную нагу або зламаную руку,
20 ані гарбаты, ані кволы, ані той, хто мае бяльмо на воку, ані каросьлівы, ані паршывы, ані той, хто мае пашкоджаныя яечкі.
21 Ніводзін чалавек з нашчадкаў Аарона сьвятара, у якога на целе загана, не павінен набліжацца, каб складаць ахвяру агнявую ГОСПАДУ; ён мае загану, не павінен ён набліжацца, каб складаць ахвяру хлеба для Бога свайго.
22 Але можа ён есьці хлеб Бога свайго як з [дароў] сьвятых, так і са сьвятога сьвятых.
23 Толькі ня будзе ён уваходзіць за заслону і ня будзе падыходзіць да ахвярніка, бо мае загану. Ня будзе ён паганіць сьвятыню Маю, бо Я — ГОСПАД, Які асьвячаю іх”».
24 І Майсей прамовіў гэта да Аарона, да сыноў ягоных і да ўсіх сыноў Ізраіля.

Ляв 22

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да Аарона і да сыноў ягоных, каб яны паважалі сьвятыя дары сыноў Ізраіля і не зьнеслаўлялі сьвятое імя Маё ў тым, што яны Мне пасьвячаюць. Я — ГОСПАД.
3 Скажы ім, каб ведалі пакаленьні вашыя: “Калі нехта з нашчадкаў вашых наблізіцца да рэчаў сьвятых, якія сыны Ізраіля пасьвячаюць ГОСПАДУ, а нячыстасьць ягоная на ім, такая душа будзе вынішчана спрад аблічча Майго. Я — ГОСПАД.

4 Ніводзін з насеньня Аарона, які пракажоны або мае выцёкі, ня будзе есьці сьвятых [дароў],
пакуль не ачысьціцца. І хто дакранецца да чаго нячыстага ад памёршага або ў каго здарыцца
выцёк насеньня,
5 або хто дакранецца паўзуна, якім занячысьціцца, або чалавека, які зрабіў бы яго нячыстым
нячыстасьцю сваёю,
6 душа, якая дакранецца гэтага, будзе нячыстай аж да вечара і ня будзе есьці сьвятых [дароў],
пакуль не абмые цела сваё ў вадзе.
7 Пасьля заходу сонца будзе ён ачышчаны, і тады будзе есьці сьвятыя [дары], бо яны ёсьць ежай
ягонаю.
8 Ня будзе ён есьці падліны ані разьдзёртых жывёлаў, бо праз гэта станецца нячысты. Я —
ГОСПАД.
9 Няхай захоўваюць загады Мае, каб ня мелі грэху і каб не памерлі з прычыны таго, што
зьняважаць іх. Я — ГОСПАД, Які асьвячаю іх.
10 Ніводзін чужынец ня будзе есьці сьвятых [дароў]; ані той, што жыве ў сьвятара, ані найміт
ня будзе есьці сьвятых рэчаў.
11 Калі ж сьвятар купіць нявольніка за грошы, той можа есьці сьвятое, таксама народжаныя ў
доме ягоным могуць есьці хлеб ягоны.
12 Калі б дачка сьвятара выйшла замуж за чужога чалавека, яна не павінна есьці гэтых сьвятых
ахвяраваных дароў.
13 Аднак, калі дачка сьвятара аўдавела або была кінута і, ня маючы дзяцей, вярнулася ў дом
бацькі свайго, як у маладосьці сваёй, будзе жывіцца хлебам бацькі свайго. Але ніхто чужы ня
будзе есьці яго.
14 Калі ж нехта несьвядома зьесьць сьвятое, дадасьць пятую частку яго [вартасьці] і аддасьць
сьвятое сьвятару.
15 [Сьвятары] ня будуць паганіць сьвятых дароў, якія сыны Ізраіля складаюць у ахвяру
ГОСПАДУ,
16 і ня будуць сьцягваць на іх віну, калі будуць есьці сьвятыя рэчы. Я — ГОСПАД, Які асьвячаю
іх”».
17 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
18 «Прамоў да Аарона, і да сыноў ягоных, і да ўсіх сыноў Ізраіля, і скажы ім: “Калі хто з дому
Ізраіля або спаміж прыхадняў, якія ў Ізраілі, паводле шлюбаваньня або як дар дабраахвотны
свой складае ахвяру сваю, якую прыносіць ГОСПАДУ на цэласпаленьне,
19 каб яна была прынятаю, мусяць прынесьці самца без заганы мужчынскага роду з валоў,
бараноў ці козаў.
20 Ніякай жывёлы, якая мае загану, не складайце ў ахвяру, бо ня будзе яна прынятая.
21 Калі хто захоча скласьці ГОСПАДУ ахвяру мірную, каб споўніць шлюбаваньне або як дар
дабраахвотны, ці гэта з валоў, ці з авечак, няхай будзе яна без заганы, каб была прынятай.
22 Ня будзеце складаць ГОСПАДУ ў ахвяру жывёлаў сьляпых, скалечаных, кульгавых, апухлых,
паршывых, у балячках. Ня будзеце такіх жывёлаў складаць на ахвярніку ў ахвяру агнявую для
ГОСПАДА.
23 Цяля або барана някшталтнага ці хворага можаш скласьці як ахвяру дабраахвотную, але як
шлюбаваная ахвяра ня будзе прынятая.
24 Жывёлу, у якой яечкі сьціснутыя, разьбітыя, вырваныя або выразаныя, не складайце ў
ахвяру ГОСПАДУ. І ня будзеце такога рабіць у зямлі вашай,
25 ані з рук чужынцаў ня будзеце складаць такіх жывёлаў як хлеб Богу вашаму, таму што гэты
недахоп іхні ёсьць заганаю, і ня будуць яны прынятыя”».
26 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
27 «Калі народзіцца табе цяля, або ягня, або казляня, будзе яно сем дзён пры матцы.
Пачынаючы ад восьмага дня і далей будзе яно прынятае як ахвяра агнявая для ГОСПАДА.
28 Але ані каровы, ані авечкі не забівайце ў адзін дзень разам з іх малым.
29 Калі складаеце ГОСПАДУ ахвяру падзякі, складайце яе так, каб была яна прынятай;

30 у той самы дзень зьешце яе; няхай не застаецца з яе нічога да раніцы другога дня. Я —
ГОСПАД.
31 Захоўвайце прыказаньні Мае і выконвайце іх. Я — ГОСПАД.
32 Не паганьце імя Маё сьвятое, каб быў Я сьвятым паміж сыноў Ізраіля. Я — ГОСПАД, Які
асьвячае вас
33 і Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, каб быць Богам вашым. Я — ГОСПАД».

Ляв 23

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Гэта сьвяты ГОСПАДА, у якія вы будзеце склікаць сходы
сьвятыя; гэта сьвяты Мае.
3 Шэсьць дзён будзеце працаваць, а сёмы дзень — супачынак супачынку, сход сьвяты, ня
будзеце зусім працаваць, бо гэта супачынак ГОСПАДА ў-ва ўсіх сядзібах вашых.
4 Вось сьвяты ГОСПАДА, сходы сьвятыя, якія павінны вы сьвяткаваць у свой час.
5 У першы месяц, у чатырнаццаты дзень месяца, вечарам Пасха ГОСПАДА.
6 А ў пятнаццаты дзень таго самага месяца сьвята Праснакоў для ГОСПАДА. Сем дзён будзеце
есьці праснакі.
7 У першы дзень будзе ў вас сход сьвяты; ня будзеце выконваць ніякай працы штодзённай,
8 але сем дзён будзеце складаць ГОСПАДУ ахвяры агнявыя. У сёмы ж дзень будзе сход сьвяты,
ніякай працы штодзённай ня будзеце рабіць”».
9 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
10 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі вы ўвойдзеце ў зямлю, якую Я дам вам, і будзеце
жаць збожжа, прынясіце сьвятару першы сноп жніва вашага.
11 Ён патрасе сноп перад абліччам ГОСПАДА, каб Ён прыняў яго; у другі дзень пасьля суботы
прынясе ён яго.
12 І ў той дзень, у якім будзеце патрэсваць сноп, складзіцё ў ахвяру цэласпаленьня ГОСПАДУ
ягня аднагадовае без заганы,
13 і ахвяру хлебную з двух дзясятых эфы мукі, запраўленай алеем, як ахвяру агнявую на мілы
пах ГОСПАДУ, і ахвяру вадкую, чвэрць гіна віна.
14 Аж да гэтага дня ня будзеце есьці ані хлеба, ані пражанага зерня, ані сырога зерня, пакуль не
складзеце дар Богу вашаму. Гэта пастанова вечная ўсім пакаленьням вашым у-ва ўсіх сядзібах
вашых.
15 Адлічыце сабе ад другога дня пасьля суботы, ад дня, у які прынесяцё снапы для патрэс-
ваньня, сем поўных тыдняў,
16 аж да дня пасьля сёмай суботы адлічыце пяцьдзясят дзён, і тады складзіце новую ахвяру
хлебную для ГОСПАДА.
17 Прынясіце з сядзібаў вашых па два хлябы для патрэсваньня, кожны з двух дзясятых эфы
мукі квашанай, якія будуць сьпечаныя як пяршыны ГОСПАДУ.
18 Апрача хлеба складзіце ў ахвяру сем бараноў без заганы, аднагадовых, аднаго маладога
бычка і двух бараноў. Яны будуць ахвяраю цэласпаленьня ГОСПАДУ разам з ахвяраю хлебнаю
і з ахвяраю вадкай. Будзе гэта ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ.
19 Ахвяруйце таксама аднаго казла як ахвяру за грэх і двух ягнятаў аднагадовых як ахвяру
мірную.
20 Сьвятар патрасе іх перад ГОСПАДАМ разам з хлябамі пяршынаў і разам з двума ягнятамі;
будзе гэта пасьвячоным для ГОСПАДА [на ўжытак] сьвятара.
21 У той самы дзень склічце сход, гэта будзе для вас сход сьвяты. Ніякай працы штодзённай
ня будзеце рабіць. Гэта пастанова вечная на ўсякім месцы пражываньня вашага ў-ва ўсіх
пакаленьнях вашых.
22 Калі будзеце жаць у зямлі вашай, ня будзеш дажынаць да мяжы поля твайго і ня будзеш
зьбіраць да рэшты каласоў на жніве тваім. Пакіньце іх убогім і прыхадням. Я — ГОСПАД, Бог
ваш”».
23 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:

24 «Прамоў да сыноў Ізраіля, кажучы: “У першы дзень сёмага месяца будзе ў вас супачынак,
сход сьвяты пры гуку трубаў.
25 Ня будзеце рабіць аніякай працы штодзённай, але будзеце складаць ГОСПАДУ ахвяру
агнявую”».
26 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
27 «Вось, у дзясяты дзень гэтага самага сёмага месяца будзе Дзень Перамольваньня, і будзе ў
вас сход сьвяты. І будзеце ўпакорваць душы вашыя і складаць ГОСПАДУ ахвяры агнявыя.
28 Ня будзеце рабіць у той дзень аніякай працы, бо гэта Дзень Перамольваньня, дзеля
перамольваньня за вас перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага.
29 Усякая душа, якая ня будзе ўпакорваць [сябе] ў той дзень, будзе вынішчана спасярод народу
свайго.
30 І кожную душу, якая будзе рабіць працу ў той дзень, Я вынішчу спасярод народу яе.
31 Ніякай працы ня будзеце рабіць. Гэта пастанова вечная ў-ва ўсіх пакаленьнях вашых у-ва
ўсіх сядзібах вашых.
32 Гэта супачынак супачынкаў для вас. І будзеце ўпакорваць душы вашыя з вечара дзявятага
дня месяца; з вечара да вечара дзясятага дня месяца будзеце сьвяткаваць суботу вашую».
33 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
34 «Прамоў да сыноў Ізраіля, кажучы: “У пятнаццаты дзень гэтага сёмага месяца сьвята
Намётаў, сем дзён для ГОСПАДА.
35 У першы дзень — сход сьвяты; не рабіце ніякай працы штодзённай.
36 Сем дзён складайце ахвяры агнявыя ГОСПАДУ. У восьмы дзень будзе ў вас сход сьвяты, і
складзіце ахвяру агнявую ГОСПАДУ. Гэта ўрачысты сход, не рабіце ніякай працы штодзённай.
37 Гэта сьвяты ГОСПАДА, у якія вы будзеце склікаць сходы сьвятыя, у якія будзеце складаць
ахвяры агнявыя ГОСПАДУ: цэласпаленьні, ахвяры хлебныя, ахвяры крывавыя і ахвяры вадкія,
кожную ў свой дзень,
38 апрача суботаў ГОСПАДАВЫХ і апрача дароў вашых, і апрача ўсяго, што будзеце ахвяроўваць
паводле шлюбаваньня або дабраахвотна ГОСПАДУ.
39 У пятнаццаты дзень сёмага месяца, калі зьберыцё плады зямлі, будзеце сьвяткаваць
урачыстасьць ГОСПАДА сем дзён; у першы дзень і ў восьмы будзе супачынак.
40 У першы дзень возьмеце сабе найпрыгажэйшыя плады дрэваў, лісты пальмавыя і галіны
дрэваў густых і вербаў рачных, і будзеце весяліцца перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага, сем
дзён.
41 Будзеце сьвяткаваць гэтае сьвята штогод сем дзён. Гэта пастанова вечная для пакаленьняў
вашых. У сёмы месяц будзеце сьвяткаваць гэтае [сьвята].
42 Сем дзён будзеце жыць у намётах. Кожны, хто з роду Ізраіля, будзе жыць у намёце,
43 каб памяталі пакаленьні вашыя, што загадаў Я сынам Ізраіля жыць у намётах, калі вывеў іх
з зямлі Эгіпецкай. Я — ГОСПАД, Бог ваш!”»
44 Гэта прамовіў Майсей да сыноў Ізраіля пра ўрачыстасьці ГОСПАДА.

Ляв 24

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Загадай сынам Ізраіля, каб прынесьлі табе для сьвечніка найчысьцейшага алею,
выціснутага з алівак, празрыстага, каб гарэлі лямпы [сьвечніка] заўсёды.
3 Прыгатуе яго Аарон за заслонай сьведчаньня ў Намёце Спатканьня, каб заўсёды ад вечара аж
да раніцы гарэў перад абліччам ГОСПАДА. Гэта пастанова вечная для пакаленьняў вашых.
4 Прыгатуе ён тыя лямпы на чыстым сьвечніку, каб гарэлі заўсёды перад абліччам ГОСПАДА.
5 Вазьмі таксама мукі і сьпячы з яе дванаццаць боханаў [хлеба]; у кожным бохане павінна быць
дзьве дзясятых эфы.
6 І пакладзеш іх у два шэрагі, па шэсьць у кожным шэрагу, на чыстым стале перад абліччам
ГОСПАДА,

7 і пакладзеш на кожны шэраг найчысьцейшага кадзіла; гэта будзе памятная частка хлеба,
ахвяра агнявая для ГОСПАДА.
8 У кожную суботу заўсёды будуць класьці іх перад абліччам ГОСПАДА як дар ад сыноў Ізраіля,
як запавет вечны.
9 Яны належаць Аарону і сынам ягоным, каб спажывалі іх у месцы сьвятым, бо гэта сьвятое
сьвятых, гэта [належыць] яму спаміж ахвяраў агнявых для ГОСПАДА. Гэта пастанова вечная».
10 І выйшаў спаміж сыноў Ізраіля сын адной Ізраільцянкі, народжаны ад Эгіпцяніна. І ён
пасварыўся ў табары з адным Ізраільцянінам,
11 і сын Ізраільцянкі блюзьніў супраць імя [Госпада], і кляў Яго. І прывялі яго да Майсея. Імя
маці ягонай — Шэляміт, дачка Дыбры, з калена Дана.
12 Аддалі яго пад варту, пакуль ня высьветліцца, што [прамовяць] вусны ГОСПАДА.
13 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
14 «Выведзі блюзьнерцу па-за табар, і ўсе, хто яго чуў, паложаць рукі свае на галаву ягоную, і
ўся грамада ўкамянуе яго.
15 А да сыноў Ізраіля прамоў, кажучы: “Чалавек, які будзе клясьці Бога свайго, панясе грэх
свой.
16 І хто зблюзьніць супраць імя ГОСПАДА, сьмерцю памрэ. Уся грамада, камянуючы, укамянуе
яго, ці ён будзе прыхадзень, ці тутэйшы. Хто блюзьніць на імя ГОСПАДА, той сьмерцю памрэ.
17 Хто ўдарыць і заб’е душу чалавечую, сьмерцю памрэ.
18 Хто заб’е жывёлу, будзе абавязаны да звароту: жывёлу за жывёлу.
19 Калі хто скалечыць бліжняга свайго, як ён зрабіў, так і яму зробяць.
20 Пералом за пералом, вока за вока, зуб за зуб. У які спосаб ён скалечыў, такім чынам і ён
будзе скалечаны.
21 Хто заб’е жывёлу, аддасьць іншую [жывёлу]; хто заб’е чалавека, сьмерцю памрэ.
22 Роўны суд няхай будзе ў вас, ці для прыхадня, ці для тутэйшага. Бо Я — ГОСПАД, Бог ваш!”»
23 І прамовіў Майсей да сыноў Ізраіля, і вывелі блюзьнерцу па-за табар і ўкаменавалі яго
камянямі. І сыны Ізраіля зрабілі так, як загадаў ГОСПАД Майсею.

Ляв 25

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея на гары Сынай, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі вы ўвойдзеце ў зямлю, якую Я дам вам, зямля
таксама павінна супачываць у супачынкі ГОСПАДА.
3 Шэсьць гадоў будзеш засяваць поле сваё і шэсьць гадоў будзеш абразаць вінаграднік свой і
зьбіраць з іх плады,
4 але ў сёмы год няхай будзе супачынак супачынкаў, для зямлі будзе супачынак ГОСПАДА. Ня
будзеш засяваць поля твайго і падразаць вінаграднік твой.
5 Таго, што само вырасьце на пожні тваёй, ня будзеш жаць, і ня будзеш зьбіраць вінаграду
неабрэзанага. Гэта будзе год супачынку для зямлі.
6 [Што само вырасьце] падчас супачынку зямлі, будзе вам на ежу, табе, слузе твайму, служцы
тваёй, парабку твайму і пасяленцу твайму, які жыве ў цябе,
7 і жывёле тваёй, і зьвярам, якія жывуць на зямлі тваёй, увесь ураджай будзе на ежу.
8 І палічыш сем гадоў суботніх, сем разоў па сем гадоў, і будзе дзён сямі гадоў суботніх сорак
дзевяць гадоў.
9 У дзясяты дзень сёмага месяца затрубіш у рог, у Дзень Перамольваньня няхай разыйдзецца
[гук] рогу па ўсёй зямлі вашай.
10 І будзеце сьвяціць пяцідзясяты год, і абвесьціце свабоду на зямлі ўсім жыхарам ейным. Гэта
будзе для вас юбілей. Кожны з вас вернецца да уласнасьці сваёй, і кожны вернецца ў сям’ю
сваю.
11 Гэты пяцідзясяты год будзе для вас годам юбілейным; ня будзеце сеяць, ня будзеце жаць
таго, што вырасьце, і ня будзеце зьбіраць неабрэзанага вінаграду,
12 бо гэта будзе для вас юбілей, гэта будзе для вас сьвяты час. Будзеце есьці тое, што вырасьце
на полі.

13 У гэты год юбілейны кожны з вас вернецца да ўласнасьці сваёй.
14 Калі што будзеш прадаваць бліжняму свайму або купляць з рукі бліжняга свайго, ня
крыўдзіце адзін аднаго.
15 Паводле ліку гадоў пасьля юбілею ты павінен купляць у бліжняга свайго, і паводле ліку
гадоў ураджаю ён павінен прадаваць табе.
16 Чым больш гадоў застаецца да юбілею, тым большую цану заплаціш; а чым менш гадоў
застаецца, тым меншую цану заплаціш, бо колькасьць ураджаяў ён прадае табе.
17 Ня крыўдзіце адзін аднаго, але бойцеся Бога свайго, бо Я — ГОСПАД, Бог ваш!
18 Выконвайце пастановы Мае і прысуды Мае захоўвайце і выконвайце іх, і будзеце жыць на
зямлі гэтай у бясьпецы.
19 І будзе зямля даваць плод свой, і вы будзеце есьці ўдосталь, і будзеце жыць на зямлі ў
бясьпецы.
20 А калі скажаце: “Што мы будзем есьці ў сёмым годзе, калі ня будзем ані сеяць, ані зьбіраць
ураджаю нашага?”
21 Я спашлю на вас дабраславенства ў шостым годзе, і хопіць вам ураджаю на тры гады.
22 У восьмым годзе будзеце сеяць і будзеце есьці са старога ўраджаю аж да дзявятага году, аж
да новага ўраджаю будзеце есьці даўнія [плады].
23 Зямлю ня будзеце прадаваць назаўсёды, бо Мая зямля, а вы — прыхадні і пасяленцы ў Мяне.
24 Таму ўся зямля, якая ў валоданьні вашым, будзе прадавацца вамі пад умовай выкупу.
25 Калі зьбяднее брат твой і прадасьць частку маёмасьці сваёй, няхай прыйдзе адкупіцель,
сваяк ягоны, і выкупіць маёмасьць, прададзеную братам ягоным.
26 Калі ж хто ня мае адкупіцеля, але рука ягоная знойдзе належныя сродкі на выкуп,
27 няхай падлічыць ён гады ад часу продажу і зьверне рэшту таму, каму прадаў [зямлю], і
вернецца да маёмасьці сваёй.
28 Калі не здабудзе рука ягоная належных сродкаў на выкуп, маёмасьць застанецца ў
валоданьні таго, хто купіў, аж да юбілейнага году. А ў юбілейны год яна выйдзе ад яго, і
вернецца [ранейшы ўладальнік] да маёмасьці сваёй.
29 Калі хто прадасьць дом жылы ў горадзе, [які акружаны] мурам, той будзе [мець права]
выкупу аж да канца году продажу; столькі дзён будзе [права] выкупу.
30 Калі дом ня выкупяць на працягу году, дом у горадзе, акружаным мурам, застанецца
назаўсёды ўласнасьцю таго, хто купіў, і нашчадкаў яго. Ня выйдзе [з рук іхніх] у юбілейны
год.
31 А дамы ў вёсках, якія не акружаныя мурам, будуць лічыцца на роўні з зямлёю; будуць яны
падлягаць выкупу, а ў юбілейным годзе выйдуць з валоданьня таго, хто купіў.
32 Што да гарадоў лявітаў і дамоў у гарадах, якія яны маюць на ўласнасьць, дык лявіты заўсёды
могуць выкупіць [дамы свае].
33 Калі хто купіць у лявітаў дом у горадзе, маёмасьць гэтая выйдзе з рук ягоных у юбілейным
годзе, бо дамы лявітаў — гэта маёмасьць іхняя сярод сыноў Ізраіля.
34 Таксама палёў вакол гарадоў іхніх нельга прадаваць, бо гэта іх маёмасьць вечная.
35 Калі брат твой зьбяднее і аслабее рука ягоная, ты падтрымай яго, каб ён мог жыць з табою
як прыхадзень або пасяленец.
36 Не бяры ад яго ані адсоткаў, ані ліхвы. Бойся Бога твайго, каб брат твой мог жыць у цябе.
37 Не давай яму грошы твае на адсоткі і не вымагай ад яго ліхвы за ежу тваю.
38 Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, каб даць вам зямлю Ханаан і каб быць
вашым Богам!
39 Калі брат твой з убогасьці змушаны будзе прадацца табе, не прыціскай яго працаю
нявольнічай,
40 але будзеш з ім абыходзіцца як з парабкам і пасяленцам. Будзе ён табе служыць да
юбілейнага году,
41 а тады выйдзе ён, і сыны ягоныя з ім і вернецца да сям'і сваёй, і вернецца ў валоданьне
бацькоў сваіх.

42 Бо яны — нявольнікі Мае, якіх Я вывеў з зямлі Эгіпецкай; не павінны яны быць прадаваныя
як нявольнікі.
43 Ня будзеш уціскаць іх сурова, але будзеш баяцца Бога твайго.
44 Нявольнік твой або нявольніца твая няхай будуць купленыя ў народаў, якія вакол цябе, у іх
купляй нявольніка і нявольніцу.
45 Таксама купляйце дзяцей пасяленцаў, якія пасяліліся ў вас, і з сем'яў іхніх, якія жывуць у
вас, і якія нарадзіліся ў зямлі вашай. Яны будуць уласнасьцю вашай,
46 і як спадчыну перадавайце іх сынам вашым, і мейце іх назаўсёды як нявольнікаў. Але над
братамі сваімі, сынамі Ізраіля, не пануйце сурова.
47 Калі прыхадзень або пасяленец твой разбагацее, а брат твой зьбяднее і прадасьць сябе
прыхадню, які пасяліўся ў цябе, або нашчадку сям'і прыхадня,
48 пасьля продажу можа ён быць выкуплены. Няхай адзін з братоў ягоных выкупіць яго.
49 Або дзядзька ягоны, або сын дзядзькі, або нехта са сваякоў з сям'і ягонай няхай выкупіць
яго. Або калі знойдзе [сілу] рука ягоная, няхай выкупіць сам сябе.
50 І ён разьлічыцца з тым, хто купіў яго, пачынаючы з таго году, калі ён прадаў сябе, да
юбілейнага году, і грошы, за якія ён прадаў сябе, належыць аддаць яму паводле ліку гадоў;
як дні найміта, колькі ён павінен быць у яго.
51 Калі да юбілейнага году застаецца шмат гадоў, адпаведна ліку іх няхай верне ён срэбра як
выкуп свой.
52 А калі застаецца мала гадоў да юбілейнага году, ён палічыць іх і, адпаведна ліку тых гадоў,
заплаціць выкуп свой.
53 Ён будзе ў [прыхадня] як найміт, з году на год. Няхай ён не ўціскае яго строга на вачах тваіх.
54 Калі ж такім чынам выкупіцца ня зможа, у юбілейным годзе выйдзе [вольны] ён і сыны
ягоныя з ім.
55 Бо сыны Ізраіля — гэта нявольнікі Мае, якіх Я вывеў з зямлі Эгіпецкай. Я — ГОСПАД, Бог ваш!

Ляв 26

1 Не рабіце сабе ідалаў і выяваў, і не стаўляйце слупоў, і каменных фігураў не стаўляйце ў
зямлі вашай, каб пакланяцца ім. Бо Я — ГОСПАД, Бог ваш.
2 Захоўвайце суботы Мае і шануйце сьвятыню Маю. Я — ГОСПАД!
3 Калі будзеце хадзіць паводле пастановаў Маіх, і захоўваць прыказаньні Мае, і спаўняць іх,
4 Я дам вам дажджы ў патрэбны час, і зямля будзе даваць ураджай, і дрэвы палявыя дадуць
плады свае.
5 І малацьба [хлеба] працягнецца да збору вінаграду, а зьбіраньне вінаграду працягнецца да
сяўбы, і будзеце есьці хлеб ваш удосталь, і будзеце жыць у бясьпецы на зямлі сваёй.
6 І Я дам мір у зямлі вашай, і будзеце вы спаць, і ня будзе каму вас палохаць. І Я прыбяру дзікіх
зьвяроў з зямлі, і меч ня будзе праходзіць па зямлі вашай.
7 Вы будзеце гнаць ворагаў вашых, і будуць яны падаць перад абліччам вашым ад мяча.
8 Пяцёх з вас прагоняць сотню, і сотня з вас прагоніць дзесяць тысячаў. І будуць падаць ворагі
вашыя перад абліччам вашым ад мяча.
9 І Я прыхілюся да вас, і дам вам плоднасьць, і вы памножыцеся; і Я заключу запавет Мой з
вамі.
10 І вы будзеце есьці [збожжа] з леташніх збораў, а калі прыйдуць новыя [зборы], павыкідаеце
[старыя].
11 І Я пастаўлю Сялібу Маю сярод вас, і ня будзе брыдзіцца вамі душа Мая.
12 Я буду хадзіць сярод вас і буду Богам вашым, а вы будзеце народам Маім.
13 Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, каб вы не былі там нявольнікамі. Я
зламаў ярмо вашае, каб хадзілі вы з узьнятымі галовамі.
14 А калі вы ня будзеце слухаць Мяне і ня будзеце выконваць усе гэтыя прыказаньні,
15 калі пагардзіце пастановамі Маімі, і ня будзеце зважаць на прысуды Мае, і ня будзеце вы-
конваць усіх прыказаньняў Маіх, і будзеце парушаць запавет Мой,

16 тады Я гэтак зраблю вам, і наведаю вас жахам раптоўным, сухотамі і гарачкай, якія
спрычыняюць сьлепату і нішчаць здароўе. Дарэмна будзеце сеяць насеньне вашае, бо зьядуць
яго ворагі вашыя.
17 І Я зьвярну аблічча Маё супраць вас, і будзеце вы падаць перад абліччам ворагаў вашых, і
будуць панаваць над вамі тыя, якія вас ненавідзяць, і будзеце вы ўцякаць, хоць ніхто ня будзе
гнацца за вамі.
18 А калі і тады ня будзеце слухаць Мяне, Я павялічу кары на вас за грахі вашыя ў сем разоў,
19 і зьнішчу пыхлівасьць сілы вашай, і зраблю для вас неба як жалеза, а зямлю — як медзь.
20 Дарэмна будзе марнавацца праца вашая, і зямля вашая ня будзе даваць ураджаю свайго, а
дрэвы палявыя не дадуць пладоў сваіх.
21 Калі і далей будзеце Мне працівіцца і не захочаце слухаць Мяне, Я павялічу кары на вас за
грахі вашыя ў сем разоў.
22 Я напушчу на вас зьвяроў палявых, якія пазбавяць вас [дзяцей] і зьнішчаць жывёлу вашую,
і зьменшаць вас; і пустымі стануцца шляхі вашыя.
23 Калі і далей ня будзеце навучаныя Мною і будзеце працівіцца Мне,
24 Я таксама пайду супраць вас, і буду вас караць у сем разоў цяжэй за грахі вашыя.
25 Я навяду на вас меч, мсьціўцу за парушэньне запавету. А калі паўцякаеце ў гарады вашыя,
Я пашлю заразу на вас, і будзеце выдадзеныя ў рукі ворагаў.
26 Калі Я зьнішчу вашую падпору хлебную, тады пекчы будуць дзесяць жанчынаў хлеб сабе ў
адной печцы і будуць выдаваць пад мерку, і вы будзеце есьці, і не насыціцеся!
27 А калі тады ня будзеце слухаць Мяне і будзеце працівіцца Мне,
28 Я выступлю супраць вас з гвалтоўнай ярасьцю; і Я пакараю вас сямікроць за грахі вашыя,
29 і вы будзеце есьці целы сыноў вашых і дачок вашых.
30 і Я зруйную ўзгоркі вашыя, і паб'ю слупы вашыя, і кіну трупы вашыя на ідалаў вашых, і будзе
брыдзіцца душа Мая вамі.
31 Гарады вашыя зраблю руінамі, і спустошу сьвятыні вашыя, і не прыйму больш паху ахвяраў
вашых.
32 І Я спустошу зямлю гэтую, аж будуць дзівіцца ворагі вашыя, якія заселяць яе.
33 А вас Я расьцярушу між народамі і пушчу меч усьлед за вамі; і будзе зямля вашая пусткаю,
а гарады вашыя будуць руінамі.
34 Тады зямля будзе адзначаць суботы свае ўсе дні спусташэньня свайго, а вы [будзеце] ў зямлі
ворагаў вашых. Тады зямля будзе адпачываць і сьвяткаваць суботы свае.
35 Усе дні спусташэньня свайго будзе яна адпачываць, бо не адпачывала ў гады суботнія, калі
вы ў ёй жылі.
36 А для тых, хто з вас застанецца, Я спашлю страх у сэрцы іхнія ў зямлі ворагаў іхніх. Будзе
палохаць іх шум лістка, што ляціць, і будуць уцякаць, як ад мяча; і хоць ніхто ня будзе за імі
гнацца, і будуць падаць.
37 І будуць спатыкацца адзін аб другога, быццам ад мяча, хоць ніхто ня будзе гнацца за імі. Ня
зможаце вы ўстаяць перад абліччам ворагаў вашых.
38 І вы загінеце паміж народамі, і праглыне вас зямля ворагаў вашых!
39 А тыя, хто з вас застануцца, будуць марнець у беззаконьнях сваіх у землях ворагаў сваіх, і
за беззаконьні бацькоў сваіх змарнеюць, як і яны.
40 І прызнаюць яны беззаконьні свае і беззаконьні бацькоў сваіх, здраду, якой здрадзілі Мне і
працівіліся Мне.
41 Таму Я выйшаў супраць іх і ўвёў іх у зямлю ворагаў іхніх, каб упакорылася неабразанае
сэрца іхняе, і каб яны панесьлі кару за беззаконьні свае.
42 І Я ўзгадаю запавет Мой з Якубам, і запавет Мой з Ісаакам, і запавет Мой з Абрагамам. І Я
ўзгадаю зямлю гэтую.
43 Зямля гэтая была пакінутая імі; і будзе яна сплочваць суботы свае праз тое, што будзе
спустошана за правіны іх, а яны будуць несьці кару за беззаконьні свае, бо адкінулі прысуды
Мае і брыдзілася душа іхняя пастановамі Маімі.

44 Але і тады, калі яны будуць у зямлі ворагаў іхніх, Я не адкіну іх зусім і ня буду брыдзіцца
імі так, каб цалкам іх зьнішчыць і зламаць запавет Мой з імі, бо Я — ГОСПАД, Бог іхні.
45 І Я прыгадаю ім запавет Мой з продкамі іхнімі, якіх Я вывеў з зямлі Эгіпецкай на вачах
народаў, каб быць іх Богам. Я — ГОСПАД!»
46 Гэта пастановы, прысуды і законы, якія даў ГОСПАД на гары Сынай адносна Сябе і сыноў
Ізраіля у рукі Майсея.

Ляв 27

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі які чалавек дае шлюбаваньне пасьвяціць душу
ГОСПАДУ паводле ацэнкі тваёй,
3 калі гэта будзе мужчына ад дваццаці да шасьцідзесяці гадоў, ён будзе ацэнены ў пяцьдзясят
сыкляў срэбра паводле сыкля сьвятыні,
4 а калі жанчына, яна будзе ацэнена ў трыццаць сыкляў.
5 А калі яму ад пяці гадоў да дваццаці будзе ацэнка твая за мужчыну — дваццаць сыкляў, а за
жанчыну — дзесяць сыкляў.
6 А калі яму ад аднаго месяца да пяці гадоў, будзе ацэнка твая за мужчыну пяць сыкляў, а за
жанчыну — тры сыклі.
7 А калі яму ад шасьцідзесяці гадоў і вышэй, будзе ацэнка твая за мужчыну пятнаццаць сыкляў,
а за жанчыну — дзесяць сыкляў.
8 А калі хто такі бедны, каб заплаціць ацэнку тваю, няхай паставяць яго перад абліччам
сьвятара, і ацэніць яго сьвятар паводле таго, што можа даць рука яго, і няхай тое дасьць.
9 Калі гэта будзе быдла, якое складаецца ў ахвяру ГОСПАДУ, тады ўсё, што шлюбаваў для
ГОСПАДА, ёсьць сьвятым.
10 Нельга яго замяніць, ані лепшае — горшым, ані горшае — лепшым. А калі хто заменіць быдла
на быдла, і тое, што заменена, і на што заменена, будзе сьвятым для ГОСПАДА.
11 А калі гэта будзе жывёла нячыстая, якой нельга складаць у ахвяру ГОСПАДУ, няхай
паставяць яе перад абліччам сьвятара,
12 і сьвятар ацэніць яе, ці яна добрая, ці благая, і як ацэніць яе сьвятар, так і будзе.
13 Калі хто [захоча] выкупіць яе, няхай дадасьць пятую частку да ацэнкі яго.
14 Калі хто пасьвяціць дом свой ГОСПАДУ як сьвятую рэч, тады сьвятар ацэніць той дом, ці ён
добры, ці благі. Як сьвятар ацэніць яго, так і будзе.
15 А калі той, хто пасьвяціў яго, [захоча] выкупіць дом свой, няхай дадасьць пятую частку
кошту яго, і будзе яго.
16 Калі хто пасьвяціць ГОСПАДУ [частку] поля ўласнасьці сваёй, ацэнка твая павінна быць
паводле зерня на засеў: за засеў гомару ячменя — пяцьдзясят сыкляў срэбра.
17 Калі хто пасьвяціць поле сваё ў год юбілейны, твая ацэнка будзе важная.
18 Калі ж хто пасьвяціць зямлю сваю пасьля году юбілейнага, тады сьвятар палічыць срэбра
паводле гадоў, якія застаюцца да наступнага году юбілейнага, і зьменшыць ацэнку.
19 Калі той, хто пасьвяціў поле, хоча выкупіць яго, няхай дадасьць пятую частку вышэй ацэнкі
тваёй, і будзе яго.
20 А калі ён ня выкупіць поля, і калі гэтае поле будзе прададзена некаму іншаму, яно ня можа
быць выкупленае.
21 І станецца поле гэтае ў годзе юбілейным свабодным, сьвятым для ГОСПАДА, як поле пад
закляцьцем. Станецца яно ўласнасьцю сьвятара.
22 А калі хто пасьвяціць ГОСПАДУ поле набытае, якое не з уласнасьці ягонай,
23 тады сьвятар палічыць вялікасьць ацэнкі тваёй да юбілейнага году, і павінен ён аддаць у той
самы дзень ГОСПАДУ [кошт] ацэнкі тваёй як сьвятыню.
24 У год юбілейны зямля вернецца да таго, ад каго была куплена, чыёй была ўласнасьцю.
25 Кожная ацэнка твая павінна быць паводле сыклю сьвятыні. Адзін сыкль будзе дваццаць
гераў.

26 Першароднае з быдла, якое першароднае для ГОСПАДА, ці то вол, ці то баран, ніхто ня можа
пасьвяціць [Госпаду], бо яны — ГОСПАДАВЫ.
27 Калі гэта жывёла нячыстая, можна яе выкупіць паводле ацэнкі тваёй, дадаючы да яе адну
пятую. Калі ня будзе выкуплена, будзе прададзена паводле ацэнкі тваёй.
28 Калі хто пасьвяціць штосьці з уласнасьці сваёй ГОСПАДУ як заклятае: чалавека, жывёлу або
поле ўласнасьці сваёй, ня будзе гэта ані прададзена, ані выкуплена. Кожная [рэч] заклятая —
гэта сьвятое сьвятых для ГОСПАДА.
29 Ніводзін чалавек, які пасьвячоны ГОСПАДУ як закляцьце, ня можа быць выкуплены, але
сьмерцю памрэ.
30 Кожная дзесяціна зямлі з пасеву зямлі і з пладоў дрэваў [належыць] ГОСПАДУ, гэта сьвятое
для ГОСПАДА.
31 Калі б хто хацеў выкупіць [частку] дзесяціны сваёй, няхай дадасьць да яе адну пятую.
32 Кожная дзесяціна з валоў і авечак, усё дзясятае, што праходзіць пад кіем пастуха,
пасьвячона ГОСПАДУ.
33 Ня будзе адрозьнівацца, што добрае, а што благое, і ня будзе рабіцца ніякай замены. Калі хто
зробіць замену, абедзьве жывёлы будуць пасьвячоныя ГОСПАДУ. Ня будуць яны выкупленыя».
34 Гэта прыказаньні, якія даў ГОСПАД Майсею для сыноў Ізраіля на гары [Сынай].

КНІГА ЛІКІ

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея ў пустыні Сынай у Намёце Спатканьня ў першы дзень другога
месяца, у другім годзе пасьля выхаду з Эгіпту, кажучы:
2 «Пералічыце ўсю грамаду сыноў Ізраіля паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
усіх мужчынаў паводле імёнаў па галовах.
3 Ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх здатных да бою ў Ізраілі палічыце паводле дружынаў іхніх
ты і Аарон.
4 З кожнага пакаленьня павінен быць з вамі чалавек, князь роду бацькоў сваіх.
5 Вось імёны тых мужоў, якія будуць з вамі: для Рубэна — Эліцур, сын Шэдэура,
6 для Сымона — Шэлюміэль, сын Цурышадая,
7 для Юды — Нахшон, сын Амінадава,
8 для Ісахара — Натанаэль, сын Цуара,
9 для Завулёна — Эліяў, сын Гэлёна,
10 для сыноў Язэпа: для Эфраіма — Элішама, сын Амігуда; для Манасы — Гамаліэль, сын
Пэдагсура;
11 для Бэн’яміна — Абідан, сын Гідэоні,
12 для Дана — Ахіезэр, сын Амішадая,
13 для Асэра — Пагіэль, сын Акрана,
14 для Гада — Эліясаф, сын Дэўэля,
15 для Нэфталі — Ахіра, сын Энана».
16 Гэтыя пакліканыя з усёй грамады, князі пакаленьняў бацькоў сваіх і начальнікі тысячаў
Ізраіля.
17 Іх узяў Майсей і Аарон, тых мужоў, якія былі паіменна названыя.
18 У першы дзень другога месяца сабралі яны ўсю грамаду дзеля сьпісу іх паходжаньня
паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх і лічылі кожнага па імені ад дваццаці гадоў
і вышэй.
19 Як загадаў ГОСПАД Майсею, быў зроблены перапіс у пустыні Сынай.
20 Сыноў Рубэна, першароднага Ізраіля, паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх,
паводле дамоў бацькоў іхніх, па ліку імёнаў, усіх мужчынаў ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх,
здольных да бою,
21 тых, якіх палічылі з пакаленьня Рубэна, [было] сорак шэсьць тысячаў пяцьсот.
22 Сыноў Сымона паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, усіх мужчынаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
23 тых, якіх палічылі з пакаленьня Сымона, [было] пяцьдзясят дзевяць тысячаў трыста.
24 Сыноў Гада паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх, па
ліку імёнаў, усіх мужчынаў ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
25 тых, якіх палічылі з пакаленьня Гада, [было] сорак пяць тысячаў шэсьцьсот пяцьдзясят.
26 Сыноў Юды паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх, па
ліку імёнаў, усіх мужчынаў ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
27 тых, якіх палічылі з пакаленьня Юды, было семдзясят чатыры тысячы шэсьцьсот.
28 Сыноў Ісахара паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
29 тых, якіх палічылі з пакаленьня Ісахара, было пяцьдзясят чатыры тысячы чатырыста.
30 Сыноў Завулёна паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
31 тых, якіх палічылі з пакаленьня Завулёна, было пяцьдзясят сем тысячаў чатырыста.
32 Сыноў Язэпа, сыноў Эфраіма паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў
бацькоў іхніх, па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,

33 тых, якіх палічылі з пакаленьня Эфраіма, было сорак тысячаў пяцьсот.
34 Сыноў Манасы паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
35 тых, якіх палічылі з пакаленьня Манасы, было трыццаць дзьве тысячы дзьвесьце.
36 Сыноў Бэн’яміна паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў
іхніх, па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
37 тых, якіх палічылі з пакаленьня Бэн’яміна, было трыццаць пяць тысячаў чатырыста.
38 Сыноў Дана паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх, па
ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
39 тых, якіх палічылі з пакаленьня Дана, было шэсьцьдзясят дзьве тысячы семсот.
40 Сыноў Асэра паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
41 тых, якіх палічылі з пакаленьня Асэра, было сорак адна тысяча пяцьсот.
42 Сыноў Нэфталі паводле радаводу іхняга, паводле сем'яў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх,
па ліку імёнаў, ад дваццаці гадоў і вышэй, усіх, здольных да бою,
43 тых, якіх палічылі з пакаленьня Нэфталі, было пяцьдзясят тры тысячы чатырыста.
44 Гэта палічаныя, якіх палічылі Майсей і Аарон, і князі Ізраіля, дванаццаць мужоў, па адным
з кожнага дому бацькоў сваіх.
45 І было ўсіх палічаных сыноў Ізраіля паводле дамоў бацькоў іхніх, ад дваццаці гадоў і вышэй,
усіх, здольных да бою ў Ізраілі,
46 шэсьцьсот тры тысячы пяцьсот пяцьдзясят.
47 Лявіты паводле пакаленьняў бацькоў сваіх не былі палічаны сярод іх,
48 бо ГОСПАД прамовіў да Майсея, кажучы:
49 «Не перапісвай пакаленьня Левія і не лічы іх разам з сынамі Ізраіля,
50 але даручы лявітам Сялібу Сьведчаньня, усе прылады яе і ўсё, што да яе [належыць]. Яны
будуць насіць Сялібу і ўсе прылады яе, будуць пры ёй служыць і вакол Сялібы разложаць табар
[свой].
51 Калі трэба рушыць Сялібе [ў дарогу], разьбяруць яе лявіты, а калі трэба затрымацца Сялібе,
паставяць яе лявіты. Калі нехта [чужы] наблізіцца да яе, будзе забіты.
52 Сыны Ізраіля разложацца табарам, кожны на месцы сваім, кожны пад сьцягам сваім,
паводле дружынаў сваіх.
53 А лявіты разложацца табарам вакол Сялібы Сьведчаньня; і кара не спадзе на грамаду сыноў
Ізраіля. Лявіты будуць вартаваць каля Сялібы Сьведчаньня».
54 І зрабілі сыны Ізраіля ўсё; як ГОСПАД загадаў Майсею, так і зрабілі.

Лікі 2

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
2 «Няхай сыны Ізраіля разложаць табар, кожны пад сьцягам сваім, пад знакамі паводле дамоў
бацькоў сваіх. Вакол Намёту Спатканьня на адлегласьці разложаць яны табар.
3 Разложыць табар з усходу, дзе ўзыходзіць сонца, сьцяг табару Юды з дружынамі сваімі, а
князем сыноў Юды [будзе] Нахшон, сын Амінадава.
4 Лік войска ягонага, паводле падліку, — семдзясят чатыры тысячы шэсьцьсот.
5 Побач іх разложыцца табар пакаленьня Ісахара, а князем сыноў Ісахара [будзе] Натанаэль,
сын Цуара.
6 Лік войска ягонага, паводле падліку, — пяцьдзясят чатыры тысячы чатырыста.
7 [Потым] пакаленьне Завулёна, а князем сыноў Завулёна [будзе] Эліяў, сын Хэлёна.
8 Лік войска ягонага, паводле падліку, — пяцьдзясят сем тысячаў чатырыста.
9 Усіх, палічаных у табары Юды паводле дружынаў іхніх, — сто восемдзясят шэсьць тысячаў
чатырыста. Яны першыя будуць выходзіць.
10 З поўдня будзе сьцяг табару Рубэна з дружынамі сваімі, а князем сыноў Рубэна [будзе]
Эліцур, сын Шэдэура.

11 Лік войска ягонага, паводле падліку, — сорак шэсьць тысячаў пяцьсот.
12 Побач іх разложыцца табар пакаленьня Сымона, а князем сыноў Сымона [будзе] Шэлюміэль, сын Цурышадая.
13 Лік войска ягонага, паводле падліку, — пяцьдзясят дзевяць тысячаў трыста.
14 [Пасьля] пакаленьне Гада, а князем сыноў Гада [будзе] Эліясаф, сын Дэўэля.
15 Лік войска ягонага, паводле падліку, — сорак пяць тысячаў шэсьцьсот пяцьдзясят.
16 Усіх, палічаных у табары Рубэна паводле дружынаў сваіх, — сто пяцьдзясят адна тысяча чатырыста пяцьдзясят. Яны другімі будуць выходзіць.
17 Пасля вырушыць Намёт Спатканьня і табар лявітаў у сярэдзіне другіх табараў. Паводле таго, як раскладаліся табарам, так і выходзіць будуць, кожны на месцы сваім, пад сьцягам сваім.
18 З захаду будзе сьцяг табару Эфраіма з дружынамі сваімі, а князем сыноў Эфраіма [будзе]Элішама, сын Амігуда.
19 Лік войска ягонага, паводле падліку, — сорак тысячаў пяцьсот.
20 Побач іх пакаленьне Манасы; а князем сыноў Манасы [будзе] Гамаліэль, сын Пэдагсура.
21 Лік войска ягонага, паводле падліку, — трыццаць дзьве тысячы дзьвесьце.
22 [Потым] пакаленьне Бэн’яміна; а князем сыноў Бэн’яміна [будзе] Абідан, сын Гідэоні.
23 Лік войска ягонага, паводле падліку, — трыццаць пяць тысячаў чатырыста.
24 Усіх, палічаных у табары Эфраіма паводле дружынаў іхніх, — сто восем тысячаў сто. Яны трэція будуць выходзіць.
25 З поўначы будзе сьцяг табару Дана з дружынамі сваімі, а князем сыноў Дана [будзе]Ахіезэр, сын Амішадая.
26 Лік войска ягонага, паводле падліку, — шэсьцьдзясят дзьве тысячы семсот.
27 Побач іх разложыцца табарам пакаленьне Асэра, а князем сыноў Асэра [будзе] Пагіэль, сын Акрана.
28 Лік войска ягонага, паводле падліку, — сорак адна тысяча пяцьсот.
29 [Потым] пакаленьне Нэфталі, а князем сыноў Нэфталі [будзе] Ахіра, сын Энана.
30 Лік войска ягонага, паводле падліку, — пяцьдзясят тры тысячы чатырыста.
31 Усіх, палічаных у табары Дана, — сто пяцьдзясят сем тысячаў шэсьцьсот. Яны як апошнія будуць выходзіць пад сьцягамі сваімі.
32 Гэта палічаныя сыны Ізраіля паводле дамоў бацькоў сваіх. Усіх, палічаных у табары паводле дружынаў сваіх, — шэсьцьсот тры тысячы пяцьсот пяцьдзясят.
33 Лявіты не былі палічаныя сярод сыноў Ізраіля, як загадаў ГОСПАД Майсею.
34 Сыны Ізраіля зрабілі ўсё, што загадаў ГОСПАД Майсею: раскладаліся табарам пад сьцягамі сваімі і выходзілі паводле сем'яў сваіх і дамоў бацькоў сваіх.

Лікі 3

1 Вось такі радавод Аарона і Майсея ў дні, калі прамаўляў ГОСПАД да Майсея на гары Сынай.
2 Вось гэта імёны сыноў Аарона: першародны Надаў, Абігу, Элеазар і Ітамар.
3 Вось гэта імёны сыноў Аарона, памазаных сьвятароў, якім напоўнілі рукі іхнія, каб былі сьвятарамі.
4 Але Надаў і Абігу памерлі перад абліччам ГОСПАДА ў пустыні Сынай, калі наблізіліся з чужым агнём перад аблічча ГОСПАДА, і не было ў іх сыноў. І былі сьвятарамі Элеазар і Ітамар перад абліччам Аарона, бацькі свайго.
5 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
6 «Прывядзі пакаленьне Левія, і пастаў яго перад абліччам Аарона сьвятара, і няхай яны паслугуюць яму.
7 Няхай захоўваюць усё, што пад вартай яго і пад вартай ўсёй грамады адносна Намёту Спатканьня, каб выконваць службу пры Сялібе,
8 і няхай захоўваюць усе прыналежнасьці Намёту Спатканьня, спаўняючы абавязкі сыноў Ізраіля, каб выконваць службу пры Сялібе.
9 Аддай лявітаў Аарону і сынам ягоным, няхай яны будуць дадзеныя яму з сыноў Ізраіля.

10 А Аарона і сыноў ягоных пастаў, каб яны захоўвалі [службу] сьвятарскую. А калі нехта чужы
наблізіцца [да службы], мае памерці».
11 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
12 «Вось, Я ўзяў лявітаў спасярод сыноў Ізраіля замест усіх першародных, якія адчыняюць
улоньне, і лявіты будуць Маімі.
13 Бо Мой кожны першародны. У той дзень, калі ў зямлі Эгіпецкай Я выбіў усё першароднае,
Я пасьвяціў для Сябе ўсё першароднае ў Ізраілі, ад чалавека аж да жывёлы. Яны Мае! Я —
ГОСПАД!»
14 І прамовіў ГОСПАД да Майсея ў пустыні Сынай, кажучы:
15 «Палічы сыноў Левія паводле дамоў бацькоў іхніх, і паводле сем'яў іхніх, усіх мужчынскага
роду ад аднаго месяца і вышэй».
16 І палічыў іх Майсей паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, як Ён загадаў яму.
17 І вось імёны сыноў Левія: Гершон, Кегат і Мэрары.
18 А вось імёны сыноў Гершона паводле сем'яў іхніх: Лібні і Шымэй.
19 Сыны Кегата паводле сем'яў іхніх: Амрам, Іцгар, Хеўрон і Узіэль.
20 Сыны Мэрары паводле сем'яў іхніх: Махлі і Мушы. Вось гэта сем'і Левія паводле дамоў
бацькоў іхніх.
21 Ад Гершона [паходзяць] сям'я Лібні і сям'я Шымэя. Гэта сем'і Гершона
22 Лік палічаных мужчынаў ад аднаго месяца і вышэй — сем тысячаў пяцьсот.
23 Сем'і Гершона разложацца табарам за Сялібай з захаду.
24 Князем дому бацькоў Гершона [быў] Эліясаф, сын Ляэля.
25 Сынам Гершона ў Намёце Спатканьня даручана Сяліба, Намёт і пакрыцьцё ягонае, заслона
пры ўваходзе ў Намёт Спатканьня,
26 заслоны панадворку, заслона пры выхадзе на панадворак, які пры Сялібе і ахвярніку, і
вяроўкі, патрэбныя для ўсялякай службы.
27 Ад Кегата [паходзяць] сем'і Амрама, Іцгара, Хеўрона і Узіэля. Гэта сем'і Кегата.
28 Лік усіх мужчынаў ад аднаго месяца і вышэй — восем тысячаў шэсьцьсот. Яны маюць
вартаваць Сялібу.
29 Сем'і сыноў Кегата разложацца табарам з паўднёвага боку Сялібы.
30 Князем дому бацькоў Кегата [быў] Эліцафан, сын Узіэля.
31 Яны мелі рупіцца пра каўчэг, стол, сьвечнік, ахвярнікі, пра прылады сьвятыні, прызначаныя
для служэньня, пра заслону і абслугу яе.
32 А князем князёў лявітаў [быў] Элеазар, сын Аарона сьвятара. Ён наглядаў за тымі, што
спаўнялі служэньне ў сьвятыні.
33 Ад Мэрары [паходзяць] сем'і Махлі і Мушы. Гэта сем'і Мэрары.
34 Лік палічаных мужчынаў ад аднаго месяца і вышэй — шэсьць тысячаў дзьвесьце.
35 А князем дамоў бацькоў Мэрары [быў] Цурыэль, сын Абігаіля. Яны разложацца табарам з
паўночнага боку Сялібы.
36 Сынам Мэрары даручаны былі дошкі Сялібы, жэрдкі іхнія, слупкі, падставы і ўсе [рэчы] для
абслугі яе,
37 і слупкі панадворку з усіх бакоў, і падставы іхнія, і колцы іхнія з вяроўкамі іхнімі.
38 А з пярэдняга боку Сялібы, з усходу, перад Намётам Спатканьня разложацца табарам
Майсей, і Аарон, і сыны ягоныя, якім даручана Сяліба ад імя сыноў Ізраіля. Калі хто наблізіцца
чужы, будзе забіты.
39 Поўны лік лявітаў, якіх палічылі Майсей і Аарон паводле слова з вуснаў ГОСПАДА, усіх
мужчынаў ад аднаго месяца і вышэй — дваццаць дзьве тысячы.
40 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Падлічы ўсіх першародных мужчынаў сыноў Ізраіля ад аднаго
месяца і вышэй, і палічы іх паіменна,
41 і вазьмі лявітаў для Мяне як замену ўсіх першародных сярод сыноў Ізраіля. Я — ГОСПАД. І
вазьмі жывёлу лявітаў замест усёй першароднай жывёлы сыноў Ізраіля».

42 І палічыў Майсей, як загадаў яму ГОСПАД, усіх першародных сыноў Ізраіля.
43 І было ўсіх першародных мужчынаў па ліку імёнаў, ад аднаго месяца і вышэй, паводле
падліку — дваццаць дзьве тысячы дзьвесьце семдзясят тры.
44 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
45 «Вазьмі лявітаў замест усіх першародных сыноў Ізраіля і жывёлу лявітаў замест жывёлы
іхняй. І лявіты будуць Маімі. Я — ГОСПАД.
46 Як выкуп за гэтых дзьвесьце семдзясят трох з першародных сыноў Ізраіля, што
перавышаюць лік лявітаў,
47 вазьмі па пяць сыкляў ад галавы, паводле сыкля сьвятыні; сыкль мае дваццаць гераў.
48 І дасі срэбра Аарону і сынам ягоным як выкуп за тых, што перавышаюць лік».
49 І ўзяў Майсей срэбра выкупу за тых, што перавышалі лік выкупленых лявітамі.
50 Ад першародных сыноў Ізраіля атрымаў [Майсей] срэбра тысячу трыста шэсьцьдзясят пяць
[сыкляў] паводле сыкля сьвятыні.
51 І аддаў Майсей срэбра выкупу Аарону і сынам ягоным паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА,
як загадаў ГОСПАД Майсею.

Лікі 4

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
2 «Аддзялі спаміж сыноў Левія сыноў Кегата, паводле сем'яў іхніх і паводле дамоў бацькоў
іхніх,
3 ад трыццаці гадоў і да пяцідзесяці гадоў, усіх, здольных да службы, каб выконвалі работу ў
Намёце Спатканьня.
4 Гэта вось служба сыноў Кегата ў Намёце Спатканьня — [насіць] сьвятое сьвятых.
5 І ўвойдуць Аарон і сыны ягоныя, і здымуць заслону, што вісіць перад [Каўчэгам], і накрыюць
ёю Каўчэг Сьведчаньня.
6 І паложаць на яго накрыцьцё са скуры тахаш, і над ім расьцягнуць тканіну, усю з блакіту, а
потым укладуць насілы ягоныя.
7 І стол хлябоў пакладных накрыюць тканінаю з блакіту, і паставяць на ім посуд, талеркі, чашы
і кубкі на ахвяры вадкія; і хлябы пакладныя будуць на ім.
8 І паложаць на іх тканіну кармазыновую, і накрыюць накрыцьцём са скураў тахаш, і ўкладуць
насілы ягоныя.
9 І возьмуць тканіну з блакіту, і накрыюць ёй сьвечнік асьвятленьня, лямпы ягоныя, нажніцы,
пасудзіны на кнаты і ўсе пасудзіны для алею, ужываныя пры ім.
10 І ўсё гэтае накрыюць накрыцьцём са скуры тахаш, і пакладуць на насілы.
11 І на ахвярнік залаты паложаць тканіну з блакіту, і накрыюць яго накрыцьцём са скуры
тахаш, і ўкладуць насілы.
12 І возьмуць усе прыналежнасьці, ужываныя для службы ў сьвятыні, і накрыюць іх тканінай
з блакіту і накрыцьцём са скуры тахаш, і пакладуць на насілы.
13 І ачысьцяць ахвярнік [ад попелу], і накрыюць яго тканінаю з пурпуру.
14 І пакладуць на ім увесь посуд, ужываны для службы пры [ахвярніку]: папяльніцы, вілкі,
лапаткі, крапільнікі. Усе гэтыя прыналежнасьці ахвярніка накрыюць накрыцьцём са скуры
тахаш і ўкладуць насілы.
15 Пры складваньні табару, калі Аарон і сыны ягоныя скончаць накрываць [рэчы] сьвятыя і
ўсе прыналежнасьці сьвятыні, падыйдуць сыны Кегата, каб іх несьці. І нельга ім дакранацца
[рэчаў] сьвятых, каб не памерлі. Такі вось цяжар сыноў Кегата пры Намёце Спатканьня.
16 А Элеазар, сын Аарона сьвятара, будзе рупіцца пра алей на асьвятленьне, пра пахкія кадзілы,
пра заўсёдную ахвяру хлебную, і пра алей памазаньня, і пра ўсё, патрэбнае для [служэньня]
ў Сялібе, пра сьвятыню і прыналежнасьці ейныя».
17 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
18 «Не дазвольце зьнікнуць сям'і Кегата сярод лявітаў,

19 але рабіце так, каб яны жылі і не памерлі, калі будуць набліжацца да Сьвятога Сьвятых.
Аарон і сыны ягоныя няхай прыйдуць і вызначаць кожнаму служэньне ягонае і цяжар, [які
маюць несьці].
20 Але [лявіты] няхай не ўваходзяць [у сьвятыню] хоць на хвіліну, каб паглядзець, і не
памруць».
21 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
22 «Палічы сыноў Гершона паводле дамоў бацькоў іхніх і паводле сем’яў іхніх.
23 Палічы ўсіх ад трыццаці гадоў і да пяцідзесяці гадоў, усіх, здольных да службы, каб
выконвалі служэньне ў Намёце Спатканьня.
24 Вось служэньне сям'і Гершона, якое яны будуць рабіць, і цяжары [іхнія].
25 Яны будуць насіць заслоны Сялібы і Намёт Спатканьня, і накрыцьцё ягонае, і накрыцьцё са
[скуры] тахаш, якое на ім, і заслону, што каля ўваходу ў Намёт Спатканьня,
26 і заслоны панадворку, і заслону каля ўваходу ў панадворак, які вакол Сялібы і ахвярніка,
і вяроўкі, і ўсе прыналежнасьці, патрэбныя для служэньня, і ўсё, што зроблена для іх і
служэньня іхняга.
27 Паводле [слова] з вуснаў Аарона і сыноў ягоных будзе [праходзіць] усё служэньне сыноў
Гершона пры пераносцы цяжараў і пры ўсякім служэньні іхнім. Даручы ім пільнаваць усё,
што яны носяць.
28 Гэта служэньне сыноў Гершона ў Намёце Спатканьня. Будуць яны пад наглядам Ітамара,
сына Аарона сьвятара.
29 Палічы сыноў Мэрары паводле сем’яў іхніх і паводле дамоў бацькоў іхніх,
30 ад трыццаці да пяцідзесяці гадоў, усіх, здольных да службы, каб служыць у Намёце
Спатканьня.
31 І гэта абавязкі іхнія ў-ва ўсім служэньні ў Намёце Спатканьня: [насіць] дошкі Сялібы і жэрдкі
яе, слупкі яе і падставы іх,
32 і слупкі панадворку з усіх бакоў і падставы іхнія, калкі намёту і вяроўкі іхнія, і ўсе рэчы пры
іх, і ўсе прыналежнасьці іхнія, і запішыце ўсе рэчы, якія яны павінны насіць.
33 Гэта служэньне сем'яў сыноў Мэрары адносна служэньня іх у Намёце Спатканьня. Будуць
яны пад наглядам Ітамара, сына Аарона сьвятара».
34 І Майсей, і Аарон, і князі грамады палічылі сыноў Кегата паводле сем’яў іхніх і паводле
дамоў бацькоў іхніх,
35 ад трыццаці гадоў і аж да пяцідзесяці гадоў, усіх, здольных да службы, каб служыць у Намёце
Спатканьня.
36 І было налічана іх паводле сем’яў іхніх дзьве тысячы семсот пяцьдзясят.
37 Гэта палічаныя сем'і Кегата, усе, якія служаць у Намёце Спатканьня, якіх палічыў Майсей і
Аарон паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, дадзенага праз Майсея.
38 І былі палічаны сыны Гершона паводле сем’яў іхніх і паводле дамоў бацькоў іхніх,
39 ад трыццаці гадоў і аж да пяцідзесяці гадоў, усе, здольныя да службы, каб служыць у Намёце
Спатканьня.
40 І было налічана іх паводле сем’яў іхніх і паводле дамоў бацькоў іхніх дзьве тысячы
шэсьцьсот трыццаць.
41 Гэта палічаныя сем'і сыноў Гершона, усе, якія служаць у Намёце Спатканьня, якіх палічылі
Майсей і Аарон паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА.
42 І былі палічаны сем'і сыноў Мэрары паводле сем’яў іхніх і паводле дамоў бацькоў іхніх,
43 ад трыццаці гадоў і да пяцідзесяці гадоў, усе, здольныя да службы, каб служыць у Намёце
Спатканьня.
44 І было налічана іх паводле сем’яў іхніх тры тысячы дзьвесьце.
45 Гэта палічаныя сем'і сыноў Мэрары, якіх палічылі Майсей і Аарон паводле [слова] з вуснаў
ГОСПАДА, дадзенага праз Майсея.
46 Былі палічаныя ўсе лявіты, якіх палічылі Майсей, і Аарон, і князі Ізраіля паводле сем’яў
іхніх і паводле дамоў бацькоў іхніх,
47 ад трыццаці гадоў і да пяцідзесяці гадоў, усіх, здольных да спаўненьня службы ў Сялібе і да
працаў пры [нашэньні] цяжараў у Намёце Спатканьня.

48 І было налічана іх восем тысячаў пяцьсот восемдзясят.
49 Паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, дадзенага Майсею, прызначаны яны кожны да свайго
служэньня і для [нашэньня] цяжару свайго. І былі яны палічаны, як загадаў ГОСПАД Майсею.

Лікі 5

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Загадай сынам Ізраіля выдаліць з табару ўсіх пракажоных, хворых на выцёкі і апаганеных
ад нябожчыка.
3 Як мужчыну, так і жанчыну выдаліце па-за табар, каб не паганілі табару, дзе Я жыву сярод
вас».
4 І зрабілі так сыны Ізраіля, і выдалілі іх па-за табар; як прамовіў ГОСПАД да Майсея, так і
зрабілі сыны Ізраіля.
5 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
6 «Прамоў да сыноў Ізраіля: “Калі мужчына або жанчына дапусьціцца нейкага грэху адносна
людзей, і парушыць загад ГОСПАДА, будзе вінаватая душа гэтая.
7 Няхай яны вызнаюць грэх свой, які ўчынілі, і аддадуць аднагароджаньне таму, перад кім
саграшылі, з дадаткам пятай часткі.
8 Калі ў яго няма чалавека, якому мог бы зьвярнуць, аднагарадзжэньне будзе для ГОСПАДА,
аднагараджэньне гэта будзе для сьвятара, апрача барана перамольваньня, якім будзе
перамольваць за [грэх].
9 Усе сьвятыя дары, якія прыносяць сьвятару сыны Ізраіля, яму належаць.
10 Сьвятыя [дары] кожнагачалавека, якія нехта прынясе сьвятару, будуць належаць
[сьвятару]”».
11 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
12 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Муж, жонка якога здрадзіць яму, і будзе няверная
яму нявернасьцю,
13 і ляжа з ёй [чужы] мужчына, і вылье насеньне, і гэта будзе схавана ад мужа ейнага, і яна
будзе нячыстай, але няма сьведкаў і яе не злавілі [на распусьце],
14 і дух рэўнасьці зыйдзе на мужа, і ён будзе рэўнаваць жонку сваю, што яна занячысьцілася,
або зыйдзе на яго дух рэўнасьці, і ён будзе рэўнаваць жонку сваю, а яна не занячысьцілася,
15 няхай прывядзе муж жонку сваю да сьвятара і складзе ў ахвяру за яе дзясятую частку эфы
мукі ячменнай, але ня вылье на яе алею і не пакладзе кадзіла, бо гэта ахвяра рэўнасьці, ахвяра
выяўленьня, якая мае выявіць віну.
16 І няхай прывядзе сьвятар [жанчыну], і паставіць яе перад абліччам ГОСПАДА.
17 І возьме сьвятар асьвячонай вады ў посуд гліняны, і возьме сьвятар пыл з падлогі Сялібы, і
ўсыпле ў ваду.
18 І паставіць сьвятар жанчыну перад абліччам ГОСПАДА, і адкрые [валасы] на галаве
жанчыны, і паложыць на яе далоні ахвяру выяўленьня, ахвяру рэўнасьці; і ў руцэ сьвятара
будзе вада горкая, [якая нясе] праклён.
19 І запрысягне сьвятар жанчыну, і скажа ёй: “Калі ніводзін мужчына не ляжаў з табой, і калі
з іншым ты не занячысьцілася адносна мужа твайго, тады вада горкая, [якая нясе] праклён,
ачысьціць цябе.
20 А калі ты здрадзіла мужу свайму і сталася нячыстая, і іншы мужчына, а ня муж твой ляжаў
з табой, выліваючы [насеньне],” —
21 і сьвятар запрысягне жанчыну прысягай праклёну, і скажа сьвятар жанчыне: “Няхай
аддасьць цябе ГОСПАД на праклён і закляцьце ў народзе тваім, і няхай зробіць ГОСПАД, што
ўпадзе сьцягно тваё і апухне жывот твой.
22 І ўвойдзе вада праклёну ў нутро тваё, каб апух жывот твой і ўпала сьцягно тваё”. І скажа
жанчына: “Амэн, амэн”.
23 І напіша сьвятар на скрутку [словы] праклёну, і змые іх вадою горкаю,

24 і напоіць жанчыну вадою горкаю, [якая нясе] праклён, і вада праклёну ўвойдзе ў яе і
[спрычыніць] горкі боль.
25 І возьме сьвятар з рук жанчыны ахвяру рэўнасьці, і патрасе перад абліччам ГОСПАДА як
ахвяру хлебную, і складзе яе на ахвярніку.
26 І возьме жменяй частку ахвяры хлебнай як памятную частку, і спаліць яе на ахвярніку, а
пасьля дасьць жанчыне выпіць вады.
27 І вып'е жанчына ваду і калі была яна нячыстай і нявернай мужу свайму, вада праклёну
ўвойдзе ў яе, і [справіць] горкі боль, ўпадзе сьцягно ейнае і жывот ейны апухне, і станецца
тая жанчына праклятаю ў народзе сваім.
28 А калі тая жанчына не была нячыстай, але яна чыстая, будзе ачышчаная і народзіць
нашчадкаў".
29 Гэта закон адносна рэўнасьці, калі жонка здрадзіць мужу свайму і станецца нячыстай.
30 Або калі на мужа зыйдзе дух рэўнасьці і ён будзе рэўнаваць жонку сваю, і ён паставіць яе
перад абліччам ГОСПАДА, і сьвятар зробіць усё паводле закону гэтага.
31 І будзе муж чысты ад віны, а тая жонка панясе віну сваю».

Лікі 6

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: "Калі нейкі мужчына або жанчына складуць
шлюбаваньне назіру, каб пасьвяціцца ГОСПАДУ,
3 мусяць яны ўстрымацца ад віна і сікеры, воцату з віна і воцату з сікеры ня будуць піць, і
ўсякага піцьця з вінаграду ня будуць піць. Сьвежага вінаграду і сушанага ня будуць есьці.
4 У-ва ўсе дні пасьвячэньня свайго ня будзе [такі чалавек] есьці нічога з вінаграду, ад
недасьпелага вінаграду аж да выцісканага.
5 Усе дні пасьвячэньня ягонага нажніцы не дакрануцца галавы ягонай. Аж споўняцца дні, на
якія ён пасьвяціўся ГОСПАДУ, будзе ён сьвяты і мае даць свабоду валасам расьці на галаве
ягонай.
6 Усе дні пасьвячэньня ягонага ГОСПАДУ не наблізіцца ён да нябожчыка.
7 Няхай пры пахаваньні бацькі, маці, брата або сястры не занячысьціцца, бо пасьвячэньне Богу
ягонаму на галаве ягонай.
8 У-ва ўсе дні пасьвячэньня свайго сьвятым будзе ён для ГОСПАДА.
9 А калі хто раптам пры ім памрэ, і ён занячысьціць галаву пасьвячэньня свайго, ён абстрыжэ
галаву ў сёмы дзень, у дзень ачышчэньня свайго паголіць яе.
10 А ў восьмы дзень прынясе дзьвюх туркавак або двух маладых галубоў сьвятару да ўваходу
ў Намёт Спатканьня.
11 Аднаго складзе сьвятар у ахвяру за грэх, а другога — у ахвяру цэласпаленьня і перапросіць
за яго, бо ён саграшыў дзеля нябожчыка, і ў той дзень будзе пасьвячоная галава яго.
12 І зноў пасьвяціць ён ГОСПАДУ дні пасьвячэньня свайго, і прывядзе ў ахвяру ягня аднагадовае
як аднагараджэньне, а дні папярэднія ня будуць залічаны, бо ён занячысьціў пасьвячэньне
сваё.
13 І вось закон пасьвячэньня. У дзень, калі скончацца дні, якія шлюбаваў, прывядуць яго да
ўваходу ў Намёт Спатканьня,
14 і ён прынясе ў ахвяру ГОСПАДУ адно аднагадовае ягня без заганы ў ахвяру цэласпаленьня,
і адну аднагадовую авечку без заганы ў ахвяру за грэх, і аднаго барана без заганы ў ахвяру
мірную,
15 і кошык праснакоў з мукі пшанічнай, запраўленых алеем, і аладак прэсных, памазаных
алеем, і [належную] ахвяру хлебную і ахвяру вадкую.
16 Сьвятар занясе ўсё гэта перад аблічча ГОСПАДА і складзе ахвяру за грэх і ахвяру
цэласпаленьня.
17 Барана ён складзе ГОСПАДУ ў ахвяру мірную разам з кошыкам праснакоў, і складзе сьвятар
ахвяру хлебную і ахвяру вадкую.

18 І абстрыжэ назір каля ўваходу ў Намёт Спатканьня галаву пасьвячэньня свайго, і кіне валасы
ў агонь, у якім [гарыць] ахвяра мірная.
19 І возьме сьвятар звараную лапатку барана, праснак з каша і прэсную аладку, і складзе іх на
далоні назіра пасьля таго, як пастрыжэ ён [галаву] пасьвячэньня свайго.
20 І сьвятар будзе патрэсваць іх патрэсваньнем перад абліччам ГОСПАДА, бо гэта [дар] сьвяты,
які [належыць] сьвятару, апрача грудзіны патрасанай і пляча ахвяраванага. І пасьля гэтага
назір можа піць віно.
21 Гэта закон адносна назіра, які шлюбаваў ахвяру сваю ГОСПАДУ за пасьвячэньне сваё апрача
таго, што дазволіць яму рука ягоная. Паводле шлюбаваньня свайго, якое [прамовілі]вусны
ягоныя, ён зробіць, паводле закону пасьвячэньня свайго».
22 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
23 «Прамоў да Аарона і сыноў ягоных, кажучы: “Гэтак вы будзеце дабраслаўляць сыноў Ізраіля
і казаць ім:
24 "Няхай дабраславіць цябе ГОСПАД і захавае цябе!
25 Няхай спагадна гляне ГОСПАД на цябе і зьлітуецца над табою!
26 Няхай зьверне ГОСПАД аблічча Сваё на цябе і дасьць табе супакой!"
27 Няхай так заклікаюць імя Маё на сыноў Ізраіля, і Я буду дабраслаўляць іх”».

Лікі 7

1 І сталася ў дзень, калі Майсей скончыў будаваць Сялібу і памазаў яе, і пасьвяціў яе і ўсе
прыналежнасьці ейныя, і ахвярнік, і ўсе прылады ягоныя, і памазаў іх, і пасьвяціў іх,
2 прыйшлі князі Ізраіля, галовы дамоў бацькоў сваіх, князі пакаленьняў, якія стаялі на чале
перапісаных,
3 і прынесьлі дары свае перад аблічча ГОСПАДА: шэсьць крытых вазоў і дванаццаць валоў, па
адным возе ад двух князёў і па аднаму валу ад кожнага, і паставілі гэта перад Сялібай.
4 І сказаў ГОСПАД Майсею:
5 «Вазьмі [гэта] ад іх; і няхай будзе на службу пры Намёце Спатканьня. І дасі гэта лявітам
адпаведна да іх паслугі».
6 І ўзяў Майсей вазы і валоў, і аддаў іх лявітам.
7 Адпаведна да іх паслугі сынам Гершона даў два вазы і чатыры валы.
8 Восем валоў і чатыры вазы даў сынам Мэрары, адпаведна да іхняй паслугі пад наглядам
Ітамара, сына Аарона сьвятара.
9 А сынам Кегата ня даў нічога, бо іх паслуга пры [рэчах] сьвятых, каб насіць іх на рамёнах
сваіх.
10 І прынесьлі князі дары свае на пасьвячэньне ахвярніка перад ахвярніка ў дзень
пасьвячэньня ягонага.
11 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Няхай кожны з князёў штодзень прыносіць дар свой на
пасьвячэньне ахвярніка».
12 У першы дзень прынёс дар свой Нахшон, сын Амінадава, з пакаленьня Юды.
13 Ягоным дарам ахвярным былі міса срэбная ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чаша срэбная
ў семдзясят сыкляў, паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнаю мукой,
запраўленай алеем, у ахвяру хлебную,
14 залатая чаша ў дзесяць [сыкляў], напоўненая кадзілам,
15 адзін бычок, адзін баран і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
16 казёл у ахвяру за грэх,
17 і ў ахвяру мірную два валы, пяць бараноў, пяць казлоў і пяць аднагадовых ягнят. Гэта дар
ахвярны Нахшона, сына Амінадава.
18 У другі дзень прынёс [дар]Натанаэль, сын Цуара, князь Ісахара.
19 Ён прынёс свой дар ахвярны: місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную
ў семдзясят сыкляў, паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой,
запраўленай алеем, у ахвяру хлебную,
20 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам;

21 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
22 казла ў ахвяру за грэх,
23 і ў ахвяру мірную два валы, пяць бараноў, пяць казлоў і пяць аднагадовых ягнят. Гэта дар
ахвярны Натанаэля, сына Цуара.
24 У трэці дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Завулёна Эліяў, сын Хэлёна.
25 Ягоным дарам [былі]: міса срэбная ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чаша срэбная ў семдзясят
сыкляў, паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем,
у ахвяру хлебную,
26 залатая чаша ў дзесяць [сыкляў], напоўненая кадзілам,
27 адзін бычок, адзін баран і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
28 казёл у ахвяру за грэх,
29 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Эліява, сына Хэлёна.
30 У чацьвёрты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Рубэна Эліцур, сын Шэдэура.
31 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
32 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
33 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
34 казла ў ахвяру за грэх,
35 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Эліцура, сына Шэдэура.
36 У пяты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Сымона Шэлюміэль, сын Цурышадая.
37 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
38 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
39 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
40 казла ў ахвяру за грэх,
41 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Шэлюміэля, сына Цурышадая.
42 У шосты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Гада Эліясаф, сын Дэўэля.
43 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
44 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
45 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
46 казла ў ахвяру за грэх,
47 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Эліясафа, сына Дэўэля.
48 У сёмы дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Эфраіма Элішама, сын Амігуда.
49 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
50 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
51 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
52 казла ў ахвяру за грэх,
53 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Элішамы, сына Амігуда.
54 У восьмы дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Манасы Гамаліэль, сын Пэдагсура.

55 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
56 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
57 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
58 казла ў ахвяру за грэх,
59 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Гамаліэля, сына Пэдагсура.
60 У дзявяты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Бэн'яміна Абідан, сын Гідэоні.
61 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
62 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
63 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
64 казла ў ахвяру за грэх,
65 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Абідана, сына Гідэоні.
66 У дзясяты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Дана Ахіезэр, сын Амішадая.
67 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
68 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
69 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
70 казла ў ахвяру за грэх,
71 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Ахіезэра, сына Амішадая.
72 У адзінаццаты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Асэра Пагіэль, сын Акрана.
73 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
74 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
75 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
76 казла ў ахвяру за грэх,
77 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Пагіэля, сына Акрана.
78 У дванаццаты дзень [прынёс дар ахвярны] князь сыноў Нэфталі Ахіра, сын Энана.
79 Ён ахвяраваў місу срэбную ў сто трыццаць [сыкляў] вагі, чашу срэбную ў семдзясят сыкляў,
паводле сыклю сьвятыні, абедзьве напоўненыя пшанічнай мукой, запраўленай алеем, у
ахвяру хлебную,
80 залатую чашу ў дзесяць [сыкляў], напоўненую кадзілам,
81 аднаго бычка, аднаго барана і аднагадовае ягня ў ахвяру цэласпаленьня,
82 казла ў ахвяру за грэх,
83 і два валы, пяць бараноў, пяць казлоў, пяць аднагадовых ягнят у ахвяру мірную. Гэта дар
ахвярны Ахіры, сына Энана.
84 Вось [дары] ад князёў Ізраіля пры пасьвячэньні ахвярніка, у дзень яго памазаньня:
дванаццаць срэбных місаў, дванаццаць срэбных чашаў, дванаццаць залатых чашаў.
85 Кожная міса важыла сто трыццаць [сыкляў] срэбра, а кожная чаша — семдзясят [сыкляў].
Усяго срэбра начыньняў — дзьве тысячы чатырыста [сыкляў], паводле сыклю сьвятыні.
86 Чашаў залатых, напоўненых кадзілам, [было] дванаццаць; кожная чаша важыла дзесяць
[сыкляў], паводле сыклю сьвятыні. Усяго золата чашаў [было] сто дваццаць [сыкляў].

87 Усяго быдла для цэласпаленьня, [было]: дванаццаць бычкоў, дванаццаць бараноў, дванаццаць аднагадовых ягнят, і [належныя] ахвяры хлебныя, і дванаццаць казлоў у ахвяру за грэх.
88 Усяго быдла, прызначанага ў ахвяру мірную, [было]: дваццаць чатыры валы, шэсьцьдзясят бараноў, шэсьцьдзясят казлоў і шэсьцьдзясят аднагадовых ягнят. Гэта [дары] на пасьвячэньне ахвярніка, калі ён быў памазаны.
89 І калі Майсей уваходзіў у Намёт Спатканьня, каб гаварыць з [Богам], ён чуў голас, які прамаўляў да яго з-над накрыўкі, якая была над Каўчэгам Сьведчаньня паміж двума херувімамі, і [Бог] прамаўляў да яго.

Лікі 8

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да Аарона і скажы яму: “Калі будзеш запальваць лямпы, на пярэднім баку сьвечніка павінны гарэць сем лямпаў”».
3 Аарон зрабіў гэтак і на пярэднім баку сьвечніка запаліў лямпы, як загадаў ГОСПАД Майсею.
4 Такі вось быў выраб сьвечніка: куты ён быў з золата, ад падставы аж да кветак быў куты паводле ўзору, які паказаў ГОСПАД Майсею, і так ён зрабіў сьвечнік.
5 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
6 «Вазьмі лявітаў спаміж сыноў Ізраіля і ачысьці іх.
7 Ачысьці іх так: пакрапі іх вадой ахвяры за грэх, і няхай паголяць яны ўсё цела сваё, і няхай вымыюць адзеньне сваё, і будуць чыстымі.
8 І возьмуць цяля са статку і ахвяру хлебную з мукі, запраўленай алеем, а другое цяля са статку ты возьмеш у ахвяру за грэх.
9 І прывядзеш лявітаў перад Намёт Спатканьня, і зьбярэш ўсю грамаду сыноў Ізраіля.
10 І прывядзеш лявітаў перад абліччa ГОСПАДА, і сыны Ізраіля пакладуць на лявітаў рукі свае.
11 І Аарон як патрэсванае перад абліччам ГОСПАДА ахвяруе лявітаў ад сыноў Ізраіля, і будуць яны служыць ГОСПАДУ.
12 А лявіты ўскладуць рукі свае на галовы цялят, і ты аднаго з іх складзеш у ахвяру за грэх, а другога — у ахвяру цэласпаленьня для ГОСПАДА, каб перапрасіць за лявітаў.
13 І паставіш лявітаў перад абліччам Аарона і сыноў ягоных, і ахвяруеш іх як патрасанае ГОСПАДУ.
14 І аддзеліш лявітаў спаміж сыноў Ізраіля, і лявіты будуць Маімі.
15 А потым няхай прыходзяць лявіты, каб служыць у Намёце Спатканьня, і ты ачысьціш іх, і ахвяруеш іх як ахвяру патрэсваньня.
16 Бо яны Мне аддадзены спасярод сыноў Ізраіля. Узяў Я іх у сыноў Ізраіля замест усіх першародных, якія адкрываюць улоньне.
17 Бо Мае ўсе першародныя з сыноў Ізраіля, як з людзей, так і з жывёлы. Ад таго дня, у які Я выгубіў усё першароднае ў зямлі Эгіпецкай, Я іх пасьвяціў для Сябе.
18 І ўзяў Я лявітаў замест усіх першародных спаміж сыноў Ізраіля.
19 І Я даю лявітаў Аарону і сынам ягоным спаміж сыноў Ізраіля, каб яны служылі Мне за сыноў Ізраіля ў Намёце Спатканьня, каб перамольваць ГОСПАДА за сыноў Ізраіля, і ня будзе кары на сыноў Ізраіля, калі наблізяцца сыны Ізраіля да Сялібы».
20 Дык Майсей і Аарон і ўся грамада сыноў Ізраіля зрабілі з лявітамі гэтак; усё, што загадаў ГОСПАД Майсею адносна лявітаў, так і зрабілі з імі сыны Ізраіля.
21 І ачысьціліся лявіты, і памылі адзеньне сваё, а Аарон, патрэсваючы, ахвяраваў іх ГОСПАДУ і перамольваў за іх Аарон, каб былі ачышчаныя.
22 Пасьля ўвайшлі лявіты, каб спаўняць службу сваю ў Намёце Спатканьня перад абліччам Аарона і сыноў ягоных. Як загадаў ГОСПАД Майсею адносна лявітаў, так і зрабілі з імі.
23 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
24 «Гэта [закон] адносна лявітаў: ад дваццаці пяці гадоў і вышэй няхай прыходзяць яны і служаць у Намёце Спатканьня;

25 а калі будуць мець пяцьдзясят гадоў, няхай не спаўняюць службы і больш не працуюць,
26 а будуць дапамагаць братам сваім у Намёце Спатканьня ў спаўненьні службы, і служэньня
ня будуць выконваць. Так зробіш з лявітамі адносна службы іхняй».

Лікі 9

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея ў першы месяц другога году пасьля выхаду з Эгіпту ў пустыні
Сынай, кажучы:
2 «У вызначаны час сыны Ізраіля павінны спраўляць Пасху.
3 У чатырнаццаты дзень гэтага месяца вечарам справіце яе паводле ўсіх адносна яе пастановаў
і звычаяў».
4 І прамовіў Майсей да сыноў Ізраіля, каб яны справілі Пасху.
5 І яны спраўлялі Пасху ў чатырнаццаты дзень месяца вечарам у пустыні Сынай. Усё, што
загадаў ГОСПАД Майсею, зрабілі сыны Ізраіля.
6 І былі людзі, якія дзеля дакрананьня да нябожчыка сталіся нячыстымі і не маглі ў той дзень
спраўляць Пасху, і прыйшлі яны да Майсея і Аарона,
7 і сказалі ім: «Мы нячыстыя дзеля дакрананьня да нябожчыка, але дзеля чаго мы пазбаўлены
таго, каб сярод сыноў Ізраіля ў вызначаны час скласьці дар ахвярны ГОСПАДУ?»
8 І сказаў ім Майсей: «Пачакайце, і я паслухаю, што адносна вас загадае ГОСПАД».
9 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
10 «Прамоў да сыноў Ізраіля, кажучы: “Чалавек з вас ці з нашчадкаў вашых, які стаўся
нячыстым дзеля нябожчыка або дзеля далёкай дарогі, павінен спраўляць Пасху ГОСПАДА.
11 У чатырнаццаты дзень другога месяца вечарам будзе спраўляць яе. Праснакі і горкія травы
няхай спажывае.
12 Няхай не пакідаюць з яе анічога да раніцы, і косткі яе ня будуць ламаць. Няхай спраўляюць
яе паводле ўсіх пастановаў Пасхі.
13 А калі хто чысты і не ў дарозе, а Пасхі не спраўляе, вынішчана будзе душа тая з народу
свайго, бо ён не склаў дару ахвярнаго ГОСПАДУ ў свой час. Грэх свой панясе чалавек гэты.
14 А калі прыхадзень, які жыве ў вас, справіць Пасху паводле пастановаў і звычаяў Пасхі,
парадак той самы будзе ў вас і для чужынца, і для тутэйшага на зямлі гэтай”».
15 У дзень, у які была пастаўлена Сяліба, воблака накрыла Сялібу з Намётам Сьведчаньня, і ад
вечара да раніцы заставалася над Сялібай у бляску агню.
16 І так было заўсёды: днём пакрывала яе воблака, а ноччу — нібы бляск агню.
17 Калі воблака падымалася над Намётам, тады сыны Ізраіля выходзілі [ў дарогу], а на тым
месцы, дзе затрымоўвалася воблака, там раскладаліся табарам сыны Ізраіля.
18 Паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА выходзілі ў [дарогу] сыны Ізраіля, і паводле [слова] з
вуснаў ГОСПАДА раскладаліся табарам. Усе дні, у якія воблака стаяла над Сялібай, яны стаялі
табарам.
19 І калі воблака доўгі час [стаяла] над Сялібай, шмат дзён, сыны Ізраіля захоўвалі волю
ГОСПАДА і не выходзілі [ў дарогу].
20 І здаралася, што мала дзён [стаяла] над Сялібай, і [сыны Ізраіля] паводле [слова] з вуснаў
ГОСПАДА раскладаліся табарам і паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА выходзілі [ў дарогу].
21 І здаралася, што воблака [стаяла] ад вечара да раніцы, а раніцаю падымалася, і яны выходзілі
[ў дарогу]. Або [стаяла] воблака дзень і ноч, і воблака падымалася, і яны выходзілі [ў дарогу].
22 Або два дні, або месяц, або некалькі дзён [стаяла] воблака над Сялібай, і сыны Ізраіля стаялі
табарам і не выходзілі [ў дарогу].
23 Паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА яны раскладаліся табарам, і паводле [слова] з вуснаў
ГОСПАДА выходзілі [ў дарогу]. Яны захоўвалі волю ГОСПАДА паводле [слова] з вуснаў
ГОСПАДА праз Майсея.

Лікі 10

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:

2 «Зрабі сабе дзьве трубы срэбныя, кутыя, і будуць яны склікаць усю грамаду, каб рыхтаваць
табар [у дарогу].
3 І затрубяць [у трубы], і зьбярэцца да цябе ўся грамада да ўваходу ў Намёт Спатканьня.
4 А калі ў адну затрубяць, зьбяруцца да цябе князі і начальнікі дружынаў Ізраіля.
5 Калі затрубіш працягла, выйдзе [ў дарогу] табар, які з усходняга боку.
6 Калі другі раз працягла затрубіш, выйдзе [ў дарогу] табар, які з паўднёвага боку. Знакам на
вырушаньне табару будзе працяглае трубеньне.
7 На зьбіраньне царквы затрубіце, але не працягла.
8 Трубіць у трубы будуць сыны Аарона, сьвятары. Будзе гэта вам і нашчадкам вашым
пастанова вечная.
9 Калі будзеш ісьці на вайну ў зямлі вашай супраць ворага, які наступае на вас, будзеце трубіць
у трубы. Гэта будзе кліч ваш перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага, і Ён збавіць вас ад ворагаў
вашых.
10 У дзень радасьці вашай, у сьвяты і ў маладзікі, пры вашых цэласпаленьнях і ахвярах мірных,
будзеце трубіць у трубы; і яны будуць нагадваньнем перад абліччам Бога вашага пра вас. Я —
ГОСПАД, Бог ваш!»
11 І сталася ў другі год, у другі месяц, у дваццаты [дзень] месяца, паднялося воблака з-над
Сялібы Сьведчаньня.
12 І вырушылі сыны Ізраіля ў дарогу сваю з пустыні Сынай, і спынілася воблака ў пустыні
Паран.
13 Першы раз паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, [дадзенага] праз Майсея, вырушылі ў дарогу.
14 Першым вырушыў сьцяг табару сыноў Юды з дружынамі сваімі, а над дружынамі ягонымі
[быў] Нахшон, сын Амінадава.
15 А над дружынамі пакаленьня сыноў Ісахара [быў] Натанаэль, сын Цуара.
16 А над дружынамі пакаленьня сыноў Завулёна [быў] Эліяў, сын Хэлёна.
17 І разабралі Сялібу, і вырушылі сыны Гершона і сыны Мэрары, несучы Сялібу.
18 І выйшаў [у дарогу] сьцяг табару сыноў Рубэна з дружынамі сваімі, а над дружынамі
ягонымі [быў] Эліцур, сын Шэдэура.
19 А над дружынамі пакаленьня сыноў Сымона [быў] Шэлюміэль, сын Цурышадая.
20 Над дружынамі пакаленьня сыноў Гада [быў] Эліясаф, сын Дэўэля.
21 І выйшлі [ў дарогу] сыны Кегата, несучы [рэчы] сьвятыя, і пакуль яны прыйшлі, Сяліба была
ўжо пастаўлена.
22 І выйшаў [у дарогу] сьцяг табару сыноў Эфраіма з дружынамі сваімі, а над дружынамі
ягонымі [быў] Элішама, сын Амігуда.
23 А над дружынай пакаленьня сыноў Манасы [быў] Гамаліэль, сын Пэдагсура.
24 А над дружынамі пакаленьня сыноў Бэн’яміна [быў] Абідан, сын Гідэоні.
25 І выйшаў [у дарогу] сьцяг табару сыноў Дана з дружынамі сваімі, а над дружынамі ягонымі
[быў] Ахіезэр, сын Амішадая.
26 А над дружынамі пакаленьня сыноў Асэра [быў] Пагіэль, сын Акрана.
27 А над дружынамі сыноў Нэфталі [быў] Ахіра, сын Энана.
28 Вось такі быў [парадак] паходу сыноў Ізраіля з дружынамі сваімі, калі выходзілі [ў дарогу].
29 І сказаў Майсей Хававу, сыну Рэгуэля, Мадыянца, цесьця свайго: «Мы выходзім у месца,
пра якое сказаў ГОСПАД: "Я дам [яго] вам". Хадзі з намі, і будзе табе добра, бо ГОСПАД абяцаў
дабро Ізраілю».
30 Той сказаў яму: «Не пайду, але пайду ў зямлю маю і да сваякоў маіх».
31 І сказаў [Майсей]: «Не пакідай нас, бо ты ведаеш, як мы маем раскладацца табарам у
пустыні, і будзеш для нас вачыма.
32 Калі пойдзеш з намі, тады калі будзе нешта добрае, што дасьць нам ГОСПАД, мы дамо табе».
33 І вырушылі яны з гары ГОСПАДА, і ішлі на працягу трох дзён. Каўчэг Запавету ГОСПАДА ішоў
наперадзе іх на працягу трох дзён, каб знайсьці месца на табар.
34 І воблака ГОСПАДА [было] над імі ўдзень, калі яны выходзілі з табару.

35 І было, калі вырушаў Каўчэг [у дарогу], Майсей казаў: «Паўстань, ГОСПАДЗЕ, і няхай
разьбягуцца ворагі Твае, і няхай паўцякаюць тыя, што ненавідзяць Цябе, перад абліччам
Тваім».
36 А калі ставілі [Каўчэг], казаў: «Вярніся, ГОСПАДЗЕ, да шматлікага войска Ізраіля!»

Лікі 11

1 І сталася, што народ наракаў, і кепска [гэта было] ў вушах ГОСПАДА. І пачуў гэта ГОСПАД, і
разгневаўся, і ўзгарэўся на іх агонь ГОСПАДА, і зьнішчыў крайнюю частку табара.
2 І народ стаў клікаць Майсея, і Майсей маліў ГОСПАДА, і агонь спыніўся.
3 І назвалі тое месца Табэра, бо [там] узгарэўся супраць іх агонь ГОСПАДА.
4 Іншапляменьнікі, якія [былі] паміж імі, зажадалі пажаданьнем і [захацелі] вярнуцца, і разам
з імі сыны Ізраіля плакалі і казалі: «Хто дасьць нам есьці мяса?
5 Мы памятаем, як у Эгіпце мы елі дарма рыбу, і агуркі, дыні, салат, цыбулю і часнык.
6 А цяпер душа нашая ссохла, нічога іншага ня бачаць вочы нашыя, апрача манны».
7 А манна была падобная да насеньня каляндры і мела выгляд як бдалах.
8 Людзі выходзілі і зьбіралі яе, і малолі ў жорнах або таўклі ў ступе і варылі ў гаршчках, і рабілі
з яе аладкі; і смак іх быў падобны да аладак з алеем.
9 Калі ноччу раса ападала на табар, [адначасова] ападала і манна.
10 І пачуў Майсей, як народ плача сем'ямі сваімі, кожны каля ўваходу ў намёт свой. І вельмі
ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА, і гэта кепскім [было] ў вачах Майсея.
11 І сказаў Майсей ГОСПАДУ: «Чаму Ты мучыш слугу Твайго? Чаму не магу я знайсьці ласкі ў
вачах Тваіх? Чаму Ты ўсклаў на мяне цяжар усяго народу гэтага?
12 Ці ж з мяне пачаўся ўвесь народ гэты, або я нарадзіў яго, што Ты кажаш мне: "Насі яго
на ўлоньні тваім, як носіць карміцелька дзіцятка, і [занясі] ў зямлю, якую запрысяг бацькам
іхнім"?
13 Адкуль у мяне мяса, каб даць усяму народу гэтаму? З плачам [наракаюць] на мяне, кажучы:
"Дай нам мяса, каб мы наеліся!"
14 Не магу я сам насіць увесь народ гэты, бо ён зацяжкі для мяне.
15 Калі Ты такім чынам робіш са мною, прашу, забі мяне, калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх,
каб ня бачыў я няшчасьця майго!»
16 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Скліч Мне семдзясят чалавек спасярод старшыняў Ізраіля, пра
якіх ты ведаеш, што яны паважаныя ў народзе і наглядаюць за ім, і прывядзі іх у Намёт
Спатканьня, і няхай там яны стануць разам з табою.
17 А Я зыйду і буду гаварыць з табою, і вазьму з духа, які на табе, і дам ім, каб яны разам з
табою насілі цяжар народу, а ня толькі ты насіў [цяжар гэты].
18 А народу скажы: "Ачысьціцеся назаўтра і будзеце есьці мяса, бо вы плакалі на вачах
ГОСПАДА, кажучы: 'Хто дасьць нам есьці мяса? Добра было нам у Эгіпце'. І дасьць вам ГОСПАД
мяса, і будзеце есьці,
19 і не адзін дзень будзеце есьці, і ня два або пяць, або дзесяць, або дваццаць,
20 але ўвесь месяц, аж пакуль вам ня выйдзе [мяса] праз ноздры вашыя і не абрыдзіць вам,
бо вы адвярнуліся ад ГОСПАДА, які сярод вас, і наракалі перад абліччам Ягоным, кажучы:
'Навошта выйшлі мы з Эгіпту?' "»
21 І сказаў Майсей: «Шэсьцьсот тысячаў пешых у народзе гэтым, пасярод якога я [жыву], а Ты
кажаш: "Я дам ім мяса, і будуць есьці цэлы месяц"?
22 Ці ж [усе] авечкі і валы будуць забітыя для іх, каб ім хапіла? Або ці ўсе рыбы ў моры будуць
сабраныя для іх, каб ім хапіла?»
23 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Ці ж рука ГОСПАДА скарацілася? Цяпер убачыш, ці слова Маё
споўніцца, ці не».
24 І выйшаў Майсей, і прамовіў да народу словы ГОСПАДА, і склікаў семдзясят старшыняў
народу, і паставіў іх вакол Намёту.

25 І ГОСПАД зыйшоў у воблаку, і гаварыў з ім, і ўзяў з духа, які быў на [Майсею], і даў
сямідзесяці старшыням. І сталася, што дух супачыў на іх, і яны прарочылі, і перасталі.
26 А два чалавекі засталіся ў табары, імя аднаго Эльдад, а другога — Мэдад. І на іх зыйшоў дух,
бо былі яны пакліканыя, але не пайшлі ў Намёт. І яны прарочылі ў табары.
27 І прыбег юнак, і паведаміў Майсею, і сказаў: «Эльдад і Мэдад прарочаць у табары».
28 І адказаў Егошуа, сын Нуна, які ад юнацтва свайго быў на паслузе ў Майсея: «Гаспадару мой,
Майсей, забарані ім!»
29 Але Майсей сказаў яму: «Ці не зайздросны ты замест мяне? Каб жа ўвесь народ так
прарочыў, калі дасьць ім ГОСПАД Духа Свайго!»
30 І вярнуліся ў табар Майсей і старшыні Ізраіля.
31 І зыйшоў вецер ад ГОСПАДА, і прынёс ад мора перапёлак, і кінуў іх на табар з абодвух бакоў
на дзень дарогі, і пакрылі яны аблічча зямлю на два локці [вышыні].
32 І ўстаў народ, і ўвесь той дзень і ўсю ноч, і ўвесь наступны дзень зьбіралі перапёлак; хто
мала сабраў, прынёс ня менш дзесяці гомараў; і разлажылі іх навакол табару.
33 Яшчэ мяса было ў зубах іхніх і не было яшчэ зьедзена, калі ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА супраць
народу і ўдарыў ГОСПАД народ плягаю вельмі вялікай.
34 І назвалі імя таго месца Кіброт-Гатава, бо там пахавалі прагавіты народ.
35 З Кіброт-Гатавы выйшаў народ у Хацэрот і былі там.

Лікі 12

1 І гаварылі Мірыям і Аарон супраць Майсея з прычыны жанчыны Кушанкі, якую ён узяў за
жонку,
2 і казалі: «Ці ж толькі да Майсея прамаўляў ГОСПАД? Ці таксама да нас Ён не прамаўляў?» І
пачуў [гэта] ГОСПАД.
3 А Майсей быў чалавекам пакорным, больш за ўсіх людзей, якія на зямлі.
4 І сказаў раптам ГОСПАД да Майсея, і да Аарона, і да Мірыям: «Вы трох падыйдзіце да Намёту
Спатканьня». І падыйшлі ўсе трое.
5 І ГОСПАД зыйшоў у слупе воблачным, і затрымаўся каля ўваходу ў Намёт, і паклікаў Аарона
і Мірыям, і ўвайшлі яны абое.
6 І Ён сказаў [ім]: «Слухайце словы Мае. Калі будзе ў вас прарок ГОСПАДА, Я аб'яўлюся яму ў
відзежы, і ў снах буду прамаўляць да яго.
7 Ня так са слугой Маім Майсеем, ён — верны ў-ва ўсім доме Маім!
8 Вуснамі ў вусны Я прамаўляю да яго, і адкрыта, а не ў загадках, і ён бачыць ГОСПАДА! Дык
чаму адважыліся вы прамаўляць супраць слугі Майго Майсея?»
9 І запалаў гнеў ГОСПАДА супраць іх, і Ён адыйшоў.
10 І воблака адыйшло ад Намёту. І вось, Мірыям сталася белая, як сьнег, ад праказы. І
павярнуўся Аарон да Мірыям, і вось, яна пракажоная.
11 І сказаў Аарон Майсею: «Прашу, гаспадару мой, не карай нас за грэх, якога мы неразважна
дапусьціліся і якім саграшылі.
12 Няхай ня будзе яна, як спарон, які напалову гнілы выходзіць з улоньня маці сваёй».
13 І клікаў Майсей да ГОСПАДА, кажучы: «Божа, прашу Цябе, аздараві яе!»
14 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Калі б бацька яе плюнуў ёй у твар, ці ня мусіла б яна сем дзён
саромецца? Так мае яна на сем дзён быць па-за табарам, а потым вернецца».
15 І выдалена была Мірыям па-за табар на сем дзён, і народ не выходзіў [у дарогу], пакуль
Мірыям не вярнулася.
16 Пасьля народ выйшаў з Хацэроту і стаў табарам у пустыні Паран.

Лікі 13

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Пашлі людзей, і яны выведаюць зямлю Ханаан, якую Я даю сынам Ізраіля, па адным з
кожнага пакаленьня бацькоў іхніх, вышліце ўсіх князёў сярод іх».

3 І паслаў іх Майсей з пустыні Паран паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, а ўсе яны галовы сыноў
Ізраіля.
4 Вось імёны іхнія: з пакаленьня Рубэна — Шамуа, сын Закура;
5 з пакаленьня Сымона — Шафат, сын Хоры;
6 з пакаленьня Юды — Халеў, сын Ефунны;
7 з пакаленьня Ісахара — Ігаль, сын Язэпа;
8 з пакаленьня Эфраіма — Ошэа, сын Нуна;
9 з пакаленьня Бэн'яміна — Пальты, сын Рафу;
10 з пакаленьня Завулёна — Гадыэль, сын Соды,
11 з пакаленьня Язэпа, пакаленьня Манасы — Гады, сын Сусі,
12 з пакаленьня Дана — Аміэль, сын Гемальлі,
13 з пакаленьня Асэра — Сэтур, сын Міхаэля,
14 з пакаленьня Нэфталі — Нахбі, сын Вафсі,
15 з пакаленьня Гада — Геўэль, сын Махі.
16 Гэта вось імёны мужчынаў, якіх паслаў Майсей для выведваньня зямлі [Ханаан]. І Ошэа,
сына Нуна, назваў Майсей Егошуа.
17 І паслаў іх Майсей дзеля выведваньня зямлі Ханаан, і сказаў ім: «Ідзіце праз Нэгеў, і
прыйдзеце ў горы,
18 і разгледзьце зямлю, якая яна, і народ, які жыве на ёй, ці моцны ён, ці кволы, ці нямногія
лікам, ці шматлікія?
19 І якая зямля, на якой яны жывуць, ці добрая, ці ліхая? Якія гарады, у якіх яны жывуць, ці як
табар, ці з мурамі?
20 І якая зямля, ці ўрадлівая, ці пустая, ці [ёсьць] там дрэвы, ці няма іх? Будзьце мужныя і
прынясіце пладоў той зямлі». А былі тады дні дасьпяваньня вінаграду.
21 І яны пайшлі, і выведалі зямлю ад пустыні Сін аж па Рэхоб каля ўваходу ў Хамат.
22 І дайшлі да Нэгеву, а адтуль прыйшлі ў Хеўрон, дзе жылі Ахіман, Шэшай і Тальмай, нашчадкі
Анака. А Хеўрон пабудаваны на сем гадоў раней, чым Цаан у Эгіпце.
23 І дайшлі яны аж да даліны Эшколь, там зрэзалі галінку з адной гронкай вінаграду, якую
несьлі на жэрдцы два [чалавекі], ўзялі яблыкаў гранатовых і фігаў.
24 І назвалі месца тое далінай Эшколь, таму што адтуль сыны Ізраіля несьлі гронку [вінаграду].
25 І вярнуліся выведчыкі зямлі праз сорак дзён.
26 І ішлі, і прыйшлі да Майсея і Аарона, і да ўсёй грамады сыноў Ізраіля ў пустыню Паран, у
Кадэш. І зьвярнулі словы да іх і да ўсёй грамады, і паказалі ім плады той зямлі.
27 І расказвалі ім, і сказалі: «Мы прыйшлі ў зямлю, у якую ты паслаў нас, якая сапраўды ацякае
малаком і мёдам, і такія плады ейныя.
28 Але народ, які жыве на ёй, дужы, і гарады вельмі вялікія і ўмацаваныя. Бачылі мы там
таксама нашчадкаў Анака.
29 Амалекцы жывуць у зямлі Нэгеў; Хеты, Евусэі і Амарэйцы жывуць у гарах, а Хананейцы
жывуць каля мора і на беразе Ярдану».
30 І Халеў супакойваў [абурэньне] народу супраць Майсея, і казаў: «Пойдзем і здабудзем
зямлю, бо мы [можам]авалодаць ёю».
31 А іншыя, якія хадзілі з ім, казалі: «Ня зможам мы ваяваць з тым народам, бо ён дужэйшы за
нас».
32 І гаварылі ліхія весткі пра зямлю, якую аглядалі, паміж сыноў Ізраіля, кажучы: «Зямля,
якую мы прайшлі, каб выведаць яе, пажырае жыхароў сваіх, а ўвесь народ, які мы бачылі ў ёй,
— высокага росту.
33 Бачылі мы там нэфілімаў, сыноў Анака, з роду нэфілімаў, і ў вачах нашых мы былі як
саранча, і такімі ж мы былі ў вачах іхніх».

Лікі 14

1 І ўстала ўся грамада, і ўзьняла голас свой, і плакаў народ у тую ноч,

2 і наракалі на Майсея і Аарона ўсе сыны Ізраіля, і ўся грамада казала: «Лепш, каб мы памерлі
ў Эгіпце, або ў пустыні гэтай.
3 Навошта завёў нас ГОСПАД у зямлю гэтую, каб мы загінулі ад мяча, а жонкі нашыя і дзеці
нашыя пайшлі ў палон? Ці ня лепш нам вярнуцца ў Эгіпет?»
4 І казалі адзін аднаму: «Паставім сабе правадыра і вернемся ў Эгіпет».
5 І ўпалі Майсей і Аарон на абліччы свае перад усёй царквою грамады сыноў Ізраіля.
6 А Егошуа, сын Нуна, і Халеў, сын Ефунны, якія [былі] сярод выведнікаў зямлі, разьдзёрлі
шаты свае
7 і сказалі ўсёй грамадзе сыноў Ізраіля, кажучы: «Зямля, якую мы абыйшлі, каб выведаць яе,
вельмі, вельмі добрая.
8 Калі ласкавы будзе ГОСПАД, Ён увядзе нас у зямлю гэтую і дасьць нам зямлю, якая ацякае
малаком і мёдам.
9 Не бунтуйцеся супраць ГОСПАДА і ня бойцеся народу той зямлі, бо яны як хлеб для нас.
Адыйшла абарона іхняя ад іх, а з намі ГОСПАД. Ня бойцеся іх».
10 І казала ўся грамада, каб закідаць іх камянямі, але над Намётам Спатканьня зьявілася слава
ГОСПАДА перад усімі сынамі Ізраіля.
11 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Дакуль будзе зьневажаць Мяне народ гэты? Дакуль ня будзе ён
верыць усім знакам, якія Я ўчыніў сярод іх?
12 Я наведаю яго пошасьцю і зьнішчу яго. А з цябе Я зраблю вялікі народ, мацнейшы за яго».
13 І сказаў Майсей ГОСПАДУ: «І пачуюць Эгіпцяне, ад якіх Ты вывеў народ гэты магутнасьцю
Тваёй,
14 і скажуць жыхарам зямлі, якія чулі, што Ты, ГОСПАДЗЕ, пасярод народу гэтага, якому
даеш бачыць Сябе вачамі, і воблака Тваё стаіць над імі, і Ты ідзеш перад імі ўдзень у слупе
воблачным, а ўначы — у слупе вогненным.
15 Калі народ гэты выб'еш да апошняга чалавека, скажуць народы, якія пра гэта пачуюць,
кажучы:
16 "ГОСПАД ня змог увесьці народ у зямлю, якую ім запрысяг, дзеля таго Ён зьнішчыў іх у
пустыні!"
17 А цяпер няхай праславіцца моц Госпада, як Ты прамовіў, кажучы:
18 "ГОСПАД павольны да гневу і бязьмежнай міласэрнасьці, Які прабачае правіны і беззаконьні
і не пакідае без пакараньня, але карае беззаконьні бацькоў на сынах да трэцяга, а нават да
чацьвёртага [пакаленьня]".
19 Даруй, прашу, правіну народу гэтаму дзеля вялікай міласэрнасьці Тваёй, як Ты насіў народ
гэты ад Эгіпту аж дасюль».
20 І сказаў ГОСПАД: «Я прабачаю паводле слова твайго.
21 Але, як Я жывы, слава ГОСПАДА напоўніць усю зямлю!
22 Усе людзі, якія бачылі славу Маю і знакі Мае, якія Я рабіў у Эгіпце і ў пустыні, але спакушалі
Мяне ўжо дзесяць разоў і ня слухалі голасу Майго,
23 не пабачаць яны зямлі, якую Я абяцаў бацькам іхнім, і ніхто з тых, хто зьневажаў Мяне, ня
ўбачыць яе.
24 Але слугу Майго Халева, бо ён напоўнены іншым духам, Я ўвяду ў тую зямлю, у якую ён ужо
ўвайшоў, і насеньне ягонае авалодае ёю.
25 Няхай Амалек і Хананейцы жывуць у далінах. Заўтра выйдзеце [ў дарогу] і вернецеся ў
пустыню ў накірунку Мора Чырвонага».
26 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
27 «Дакуль гэтая грамада ліхая будзе наракаць на Мяне? Я пачуў нараканьні сыноў Ізраіля,
якімі яны наракаюць супраць Мяне.
28 Скажы ім: "Як жывы Я, кажа ГОСПАД. Як вы гаварылі, гэтак Я зраблю вам!
29 У гэтай пустыні пападаюць трупы вашыя! Усе палічаныя, якія наракалі на Мяне, ад дваццаці
гадоў і вышэй, паводле падліку.
30 Ня ўвойдзеце вы ў зямлю, на якой Я, падымаючы руку Маю, запрысяг пасяліць вас, апрача
Халева, сына Ефунны, і Егошуа, сына Нуна.

31 А дзяцей вашых, пра якіх вы казалі, што яны будуць здабычай, Я ўвяду, і яны авалодаюць
зямлёю, якою вы ўзгардзілі.
32 А трупы вашыя будуць ляжаць у пустыні гэтай.
33 І сыны вашыя будуць блукаць у пустыні сорак гадоў і будуць насіць нявернасьць вашую,
пакуль ня счэзнуць трупы вашыя ў пустыні.
34 Па ліку сарака дзён, на працягу якіх аглядалі вы зямлю, дзень [будзе залічаны] за год, сорак
гадоў вы будзеце насіць беззаконьне вашае і даведаецеся, што такое, калі Я пакінуў вас.
35 Я, ГОСПАД, прамовіў і гэтак зраблю гэтай грамадзе ліхой, якая бунтуецца супраць Мяне. У
гэтай пустыні вы загінеце і памрацё”».
36 І тыя людзі, якіх паслаў Майсей на выведваньне зямлі, і якія, вярнуўшыся, наракалі і схілілі
ўсю грамаду да нараканьня, даючы ліхія весткі пра зямлю,
37 тыя, што разносілі ліхія весткі пра зямлю тую, памерлі раптоўна перад абліччам ГОСПАДА.
38 Але Егошуа, сын Нуна, і Халеў, сын Ефунны, засталіся жывымі з усіх тых людзей, якія хадзілі
выведваць зямлю.
39 І прамовіў Майсей усе гэтыя словы да ўсіх сыноў Ізраіля, і народ вельмі засмуціўся.
40 І ўсталі яны раніцаю, і ўзыйшлі на вяршыню гары, кажучы: «Вось мы, і мы пойдзем на месца,
пра якое казаў ГОСПАД, бо мы саграшылі».
41 І сказаў Майсей: «Навошта вы пераступаеце [слова] з вуснаў ГОСПАДА? Гэта ня будзе мець
посьпеху.
42 Не ідзіце, бо няма ГОСПАДА з вамі, каб не пагінулі вы перад абліччам ворагаў вашых!
43 Бо Амалек і Хананейцы перад вамі, ад мяча іхняга вы пагінеце, бо вы адвярнуліся ад
ГОСПАДА, і ня будзе з вамі ГОСПАДА».
44 Але яны вырашылі ўзыйсьці на вяршыню гары; а Каўчэг Запавету ГОСПАДА і Майсей ня
выйшлі з табару.
45 І зыйшлі Амалекцы і Хананейцы, якія жылі на гары, і разьбілі іх, і гналі іх аж да Хармы.

Лікі 15

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі ўвойдзеце ў зямлю пражываньня вашага, якую Я
даю вам,
3 і будзеце складаць ахвяры ГОСПАДУ, цэласпаленьні або ахвяры крывавыя, або як спаўненьне
шлюбаваньняў, або дабраахвотныя, або пры ўрачыстасьцях вашых, каб прынесьці мілы пах
ГОСПАДУ з валоў ці з авечак,
4 тады той, хто прыносіць дар ахвярны ГОСПАДУ, [прынясе] ў ахвяру хлебную адну дзясятую
[эфы] пшанічнай мукі, запраўленай адной чацьвёртай гіну алею.
5 І віна як ахвяру вадкую дасьць разам з ахвярай цэласпаленьня або з ахвярай крывавай
чацьвёртую частку гіну на кожнае ягня.
6 А разам з ахвярай з барана складзеш як ахвяру хлебную дзьве трэці [эфы] пшанічнай мукі,
запраўленай адной трэцяй гіну алею,
7 і віна як ахвяру вадкую адну траціну гіну прынясеш на мілы пах ГОСПАДУ.
8 Калі складаеш у ахвяру цяля на цэласпаленьне або ў ахвяру крывавую як спаўненьне
шлюбаваньня, або ў ахвяру мірную для ГОСПАДА,
9 дасі разам з цялём у ахвяру хлебную тры дзясятыя часткі [эфы] пшанічнай мукі, запраўленай
паловай гіну алею,
10 а ў ахвяру вадкую дасі палову гіну віна. Гэта ахвяра агнявая на мілы пах ГОСПАДУ.
11 Так трэба рабіць пры кожнай ахвяры з цяляці, або барана, або ягняці як з авечак, так і з
козаў.
12 Паводле ліку ахвяраў, якія вы складаеце, так рабіце пры кожнай, паводле лічбы іх.
13 Кожны тутэйшы так павінен рабіць гэта, складаючы ахвяру агнявую на мілы пах ГОСПАДУ.
14 А калі нейкі прыхадзень, які ў вас, або які [шмат] пакаленьняў сярод вас, складзе ахвяру
агнявую на мілы пах ГОСПАДУ, павінен складаць яе, як і вы.

15 Пастанова царкоўная адна і для вас, і для прыхадняў у-ва ўсе пакаленьні вашыя; як вы, так
і прыхадзень будзе перад абліччам ГОСПАДА.
16 Адзін закон і адзін суд будзе як для вас, так і для прыхадняў, якія жывуць у вас”».
17 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
18 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі вы прыйдзеце ў зямлю, у якую Я заводжу вас,
19 і калі будзеце есьці хлеб той зямлі, выдзяліце дар для ГОСПАДА.
20 Пяршыны цеста вашага печыва прынясіце як дар, як дар з току прынясіце яго.
21 Будзеце складаць пяршыны цеста вашага як дар для ГОСПАДА ў-ва ўсе пакаленьні вашыя.
22 Калі праз няведаньне вы ня споўніце ўсіх гэтых прыказаньняў, якія прамовіў ГОСПАД да
Майсея,
23 таго ўсяго, што загадаў вам ГОСПАД праз Майсея, ад дня, у які ГОСПАД загадаў гэта, і праз
усе пакаленьні вашыя,
24 і станецца, што перад вачыма грамады будзе зроблена гэта занядбаньне, павінна ўся
грамада скласьці цяля ў ахвяру цэласпаленьня на мілы пах ГОСПАДУ, адпаведную ахвяру
хлебную і ахвяру вадкую, і казла ў ахвяру за грэх.
25 І перамоліць сьвятар за ўсю грамаду сыноў Ізраіля, і будзе ім адпушчана, бо было гэта
зроблена па няведаньні, і яны прынесьлі свой дар ахвярны, ахвяру агнявую для ГОСПАДА, і
ахвяру за грэх перад абліччам ГОСПАДА за занядбаньне сваё.
26 І будзе адпушчана ўсёй грамадзе сыноў Ізраіля і прыхадням, якія жывуць сярод іх, бо гэта
занядбаньне ўсяго народу.
27 Калі адна душа саграшыць занядбаньнем, няхай прынясе аднагадовую казу ў ахвяру за грэх.
28 І сьвятар перапросіць за душу, якая праз занядбаньне саграшыла перад абліччам ГОСПАДА,
і будзе за яе перапрошана, і будзе адпушчана ёй.
29 Адзін закон будзе для ўсіх, як для тутэйшых спасярод сыноў Ізраіля, так і для прыхадняў,
якія жывуць сярод вас, адносна таго, што рабіць пры занядбаньні.
30 А калі душа з тутэйшых або з прыхадняў зробіць з узьнятай рукой зьнявагу ГОСПАДУ, будзе
вынішчана душа тая спаміж народу свайго,
31 бо яна пагардзіла словам ГОСПАДА і парушыла прыказаньне Ягонае. Такая душа будзе
вынішчаная, і беззаконьне ейнае [будзе] на ёй”».
32 І былі сыны Ізраіля ў пустыні, і знайшлі яны чалавека, які зьбіраў дровы ў дзень суботы.
33 І прывялі яго тыя, кія знайшлі яго, да Майсея і Аарона, і да ўсёй грамады.
34 Яны пакінулі яго пад вартай, бо ня ведалі, што з ім зрабіць.
35 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Гэты чалавек сьмерцю памрэ. Няхай уся грамада ўкамянуе яго
па-за табарам».
36 І вывела яго ўся грамада па-за табар, і ўкаменавалі яго, як загадаў ГОСПАД Майсею, і ён
памёр.
37 І сказаў ГОСПАД Майсею, кажучы:
38 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім, каб яны зрабілі сабе фрэнзьлі на краях шатаў сваіх і
нашчадкаў сваіх і ўклалі ў іх ніткі з блакіту.
39 І будзе, калі ўбачыце фрэнзлі вашыя, узгадаеце ўсе прыказаньні ГОСПАДА, каб выканаць
іх і каб не ісьці вам за [пажаданьнямі] сэрца вашага і вачэй вашых, якія валакуць вас у
распуснасьць,
40 каб вы памяталі і каб выконвалі ўсе прыказаньні Мае, і будзеце сьвятымі перад Богам
вашым.
41 Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, каб быць Богам вашым. Я — ГОСПАД,
Бог ваш!»

Лікі 16

1 І ўзяліся Карах, сын Іцгара, сына Кегата, сына Левія, і Датан і Абірам, сыны Эліява, і Он, сын
Пэлета, з сыноў Рубэна,

2 і паўсталі перад абліччам Майсея, і [з імі] мужы з сыноў Ізраіля, дзьвесьце пяцьдзясят
[чалавек], начальнікі грамады, прадстаўнікі народу, людзі слаўныя.
3 І выступілі яны супраць Майсея і супраць Аарона, і сказалі ім: «Досыць вам, бо ўся грамада,
усе — сьвятыя, і пасярод іх ёсьць ГОСПАД. Дык чаму вы ставіце сябе вышэй царквы ГОСПАДА?»
4 І пачуў [гэта] Майсей, і ўпаў на аблічча сваё.
5 І прамовіў да Караха і да ўсёй грамады, кажучы: «Заўтра пакажа ГОСПАД, хто да Яго
[належыць], і хто сьвяты, і каго наблізіць да Сябе; і каго Ён выбраў, таго Ён наблізіць да Сябе.
6 Вось што зрабіце. Няхай Карах і ўся грамада ягоная возьмуць кадзільніцы свае,
7 і няхай у іх укладуць агонь, і заўтра пакладуць у іх кадзіла перад абліччам ГОСПАДА, і каго
выбярэ ГОСПАД, той сьвяты. Досыць вам, сыны Левія».
8 І сказаў Майсей Караху: «Слухайце, сыны Левія!
9 Ці мала вам, што Бог Ізраіля аддзяліў вас ад грамады Ізраіля, і выбраў вас Сабе, каб вы
служылі Яму ў Сялібе ГОСПАДА, і каб стаялі перад абліччам грамады, паслугуючы [Госпаду]?
10 І Ён даў наблізіцца да Сябе табе і ўсім братам тваім, сынам Левія. А вы дамагаецеся яшчэ
сьвятарства?
11 Навошта ты і ўся грамада твая злучыліся супраць ГОСПАДА? Хто такі Аарон, што вы
наракаеце супраць яго?»
12 І паслаў Майсей паклікаць Датана і Абірама, сыноў Эліява, але яны сказалі: «Ня пойдзем!
13 Ці мала табе, што ты вывеў нас з зямлі, якая ацякае малаком і мёдам, каб выгубіць нас у
пустыні, і яшчэ хочаш панаваць над намі?
14 Але ж ты ня ўвёў нас у зямлю, якая ацякае малаком і мёдам, і ня даў нам на ўласнасьць
палёў і вінаграднікаў! Хочаш вочы людзей засьляпіць? Ня пойдзем!»
15 І надта разгневаўся Майсей, і сказаў ГОСПАДУ: «Не прыймай ахвяры іхняй! У ніводнага з іх
я ня ўзяў нават асла, і нікога з іх я не пакрыўдзіў».
16 І сказаў Майсей Караху: «Заўтра ты і ўся грамада твая няхай стане перад абліччам ГОСПАДА,
ты з імі, і Аарон асобна.
17 І няхай возьме кожны кадзільніцу сваю і пакладзе ў іх кадзіла, і прынясе перад аблічча
ГОСПАДА кожны кадзільніцу сваю, дзьвесьце пяцьдзясят кадзільніцаў; і ты, і Аарон кожны
кадзільніцу сваю».
18 І кожны ўзяў кадзільніцу сваю, уклаў у яе агонь, і насыпаў кадзіла, і сталі яны каля ўваходу
ў Намёт Спатканьня, [сталі] таксама Майсей і Аарон.
19 І сабраў Карах супраць іх усю грамаду каля ўваходу ў Намёт Спатканьня. І зьявілася ўсёй
грамадзе слава ГОСПАДА.
20 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
21 «Адлучыцеся ад грамады гэтай, Я іх зьнішчу ў момант».
22 І яны ўпалі на абліччы свае, і сказалі: «Божа, Божа, Які [даеш] дух усякаму целу, ці будзеш
гневацца на ўсю грамаду, калі [толькі] адзін чалавек саграшыў?»
23 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
24 «Прамоў да грамады, кажучы: “Адыйдзіце ад жытлаў Караха, Датана і Абірама”».
25 І ўстаў Майсей, і пайшоў да Датана і Абірама, і старшыні Ізраіля пайшлі за ім.
26 І прамовіў ён да грамады, кажучы: «Адыйдзіце ад намётаў гэтых бязбожных людзей! І не
дакранайцеся нічога, што да іх [належыць], каб вы не пагінулі праз усе грахі іхнія!»
27 І адыйшліся [ўсе] ад сялібаў Караха, Датана і Абірама. А Датан і Абірам выйшлі і сталі перад
уваходам у намёты свае разам з жонкамі сваімі, сынамі і малымі дзецьмі.
28 І сказаў Майсей: «З гэтага даведаецеся, што ГОСПАД паслаў мяне, каб чыніў усе гэтыя
справы і што гэта не з майго сэрца [выйшла].
29 Калі гэтыя людзі памруць, як усе людзі паміраюць, і калі лёс іхні будзе такі, які і ў кожнага
чалавека, ГОСПАД не паслаў мяне.
30 А калі ГОСПАД створыць незвычайнае, і зямля разявіць пашчу сваю, і праглыне іх і ўсё, што
да іх [належыць], і жывыя трапяць яны ў адхлань, ведайце, што яны зьневажалі ГОСПАДА».

31 І сталася, калі ён скончыў прамаўляць слова, расчынілася зямля пад нагамі іхнімі,
32 і разявіла зямля пашчу сваю, і праглынула іх, і дамы іхнія, і ўсіх людзей, якія з Карахам, і
ўсю маёмасьць іхнюю.
33 І так жывыя трапілі яны і ўсё, што ў іх, у адхлань, і зямля накрыла іх, і [так] былі яны
вынішчаныя спаміж царквы.
34 А ўсе Ізраільцяне, якія стаялі навокал, [пачуўшы]крык іхні, паўцякалі, кажучы: «Каб і нас
зямля не праглынула».
35 І выйшаў агонь ад ГОСПАДА, і спаліў дзьвесьце пяцьдзясят чалавек, якія ахвяроўвалі кадзіла.
36 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
37 «Скажы Элеазару, сыну Аарона сьвятара, каб сабраў з пажарышча кадзільніцы, а агонь з іх
няхай выкіне далёка, бо яны асьвячоныя.
38 А з кадзільніцаў тых, якія саграшылі супраць душаў сваіх, няхай зробяць тонкія бляхі на
пакрыцьцё ахвярніка, бо іх прынесьлі перад аблічча ГОСПАДА, і яны асьвячоныя, і будуць яны
знакам для сыноў Ізраіля».
39 І ўзяў Элеазар сьвятар кадзільніцы мядзяныя, якія прынесьлі тыя, што былі спалены, і
перарабілі іх [на бляху] на пакрыцьцё ахвярніка,
40 як напамін для сыноў Ізраіля, каб ніхто чужы, які не [належыць] да насеньня Аарона, не
прыносіў кадзіла перад аблічча ГОСПАДА і ня сталася з ім тое, што з Карахам і супольнікамі
ягонымі, як прамовіў да яго ГОСПАД праз Майсея.
41 Назаўтра ўся грамада сыноў Ізраіля наракала на Майсея і Аарона, кажучы: «Вы забілі народ
ГОСПАДАЎ».
42 І сталася, калі сабралася грамада супраць Майсея і Аарона, яны накіраваліся да Намёту
Спатканьня. І вось, воблака ахутала [Намёт], і зьявілася слава ГОСПАДА.
43 І прыйшлі Майсей і Аарон перад Намёт Спатканьня.
44 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
45 «Адыйдзіцеся ад грамады гэтай, і Я зьнішчу іх у момант». А яны ўпалі на абліччы свае.
46 І сказаў Майсей Аарону: «Вазьмі кадзільніцу і ўлажы ў яе агонь з ахвярніка, улажы кадзіла,
і пабяжы хутка да грамады, і перамольвай за яе, бо ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА і пачалася пляга».
47 І зрабіў Аарон, як сказаў Майсей, і прыбег да царквы, і вось, ужо пачалася пляга сярод
народу. І ён палажыў кадзіла, і перамольваў за народ.
48 І ён стаў паміж памёршымі і жывымі, і пляга спынілася.
49 А тых, што згінула ад плягі гэтай, было чатырнаццаць тысячаў семсот, апрача памёршых з
прычыны Караха.
50 І вярнуўся Аарон да Майсея да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і спынілася пляга.

Лікі 17

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Прамоў да сыноў Ізраіля і вазьмі ад іх па кію, кій паводле дому бацькоў іхніх, ад усіх князёў
паводле дому бацькоў іхніх, дванаццаць кіёў. Імя кожнага напішы на кіі ягоным.
3 А на кіі Левія напішы імя Аарона, бо [павінна быць] па адным кіі на князя дому бацькоў сваіх.
4 І палажы іх у Намёце Спатканьня перад [Каўчэгам] Сьведчаньня, дзе Я сустракаюся з табою.
5 І станецца, што каго з іх Я абяру, таго кій заквітнее, і Я спыню [нараканьні] сыноў Ізраіля
супраць Мяне, якімі яны наракаюць вам».
6 І прамовіў Майсей да сыноў Ізраіля, і далі яму ўсе князі кіі ад князя дому бацькоў сваіх, адзін
кій ад князя, дванаццаць кіёў, і кій Аарона паміж іх.
7 Гэтыя кіі палажыў Майсей перад абліччам ГОСПАДА ў Намёце Спатканьня.
8 І сталася назаўтра, і ўвайшоў Майсей у Намёт Спатканьня, і вось, заквітнеў кій Аарона з дому
Левія, і выпусьціў пупышкі, закрасаваў і вырасьлі сьпелыя мігдалы.
9 І вынес Майсей ад аблічча ГОСПАДА ўсе кіі да ўсіх сыноў Ізраіля, і яны ўбачылі, і кожны ўзяў
кій свой.

10 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Кій Аарона палажы назад перад [Каўчэгам] Сьведчаньня, каб захаваўся як знак супраць сыноў бунту і каб спыніліся нараканьні супраць Мяне, і яны не памруць».
11 І зрабіў Майсей, як загадаў яму ГОСПАД, так і зрабіў.
12 І сказалі сыны Ізраіля Майсею, кажучы: «Вось, мы гінем, паміраем, усе паміраем!
13 Усе, хто набліжаюцца да Сялібы ГОСПАДА, паміраюць. Ці ж мы, паміраючы, будзем вынішчаны?»

Лікі 18

1 І сказаў ГОСПАД Аарону: «Ты і сыны твае, і дом бацькі твайго з табой будзеце насіць [віну за] беззаконьні адносна Сялібы. Ты і сыны твае будзеце насіць [віну за] беззаконьні адносна сьвятарства вашага.
2 Таксама браты твае, пакаленьне Левія, племя бацькі твайго, няхай наблізяцца да цябе і дапамагаюць табе; а ты і сыны твае з табою будзеце пры Намёце Спатканьня.
3 І будуць яны захоўваць тое, што патрэбнае для цябе і для Сялібы, але да сьвятых рэчаў і да ахвярніка ня будуць яны набліжацца, каб не памерлі ані яны, ані вы.
4 І будуць яны пры табе і будуць захоўваць усё адносна Намёту Спатканьня, усю службу пры Сялібе, але ніводзін чужынец ня будзе набліжацца да вас.
5 І вы будзеце захоўваць службу пры сьвятыні і пры ахвярніку, каб не было больш гневу на сыноў Ізраіля.
6 Вось, Я ўзяў братоў вашых, лявітаў, спасярод сыноў Ізраіля і даў іх як дар ГОСПАДУ, каб яны выконвалі служэньне ў Намёце Спатканьня.
7 А ты і сыны твае з табою будзеце захоўваць сьвятарства вашае і ўсё, што належыць да ахвярніка і месца за заслонай. Я даю вам як дар сьвятарства вашае, а калі чужынец наблізіцца [да яго], памрэ».
8 І прамовіў ГОСПАД да Аарона: «Вось, Я даю табе нагляд за дарамі Маімі. Усе дары, якія пасьвячаюць [Мне] сыны Ізраіля, Я даю табе і сынам тваім за служэньне [сьвятарскае] як пастанову вечную.
9 Гэта будзе табе са сьвятога сьвятых, з ахвяраў агнявых: [возьмеш] кожны дар ахвярны, ахвяру хлебную, ахвяру за грэх і ахвяру аднагараджэньня, якія Мне прыносяць; як сьвятое сьвятых [будуць] яны для цябе і для сыноў тваіх.
10 У Сьвятым Сьвятых будзеш іх есьці; кожны мужчына можа есьці гэта, бо гэта сьвятыня для цябе.
11 А ўсе дары ахвярныя, якія патрэсваюць, [складаючы], сыны Ізраіля, Я даю табе, і сынам тваім, і дочкам тваім як пастанову вечную; кожны чысты ў доме тваім будзе есьці іх.
12 Табе Я даю ўсю тлустасьць алею, і ўсю тлустасьць віна і збожжа, якое сыны Ізраіля прыносяць ГОСПАДУ як першыя плады.
13 І пяршыны, якія яны прыносяць ГОСПАДУ з усёй зямлі іхняй, будуць твае. Кожны чысты ў доме тваім, будзе есьці іх.
14 Усё, што пад закляцьцем у Ізраілі, будзе тваім.
15 Усе першародныя ўлоньня кожнага цела, якія прыносяцца ГОСПАДУ, ці з людзей, ці з жывёлы, будуць тваімі. Але людзей першародных і кожнай жывёлы, якая нячыстая, выкупіш, выкупляючы.
16 Выкупіш іх праз месяц пасьля нараджэньня за пяць сыкляў срэбра паводле сыклю сьвятыні; сыкль мае дваццаць гераў.
17 Першародных каровы, першародных авечкі і першародных казы ня будзеш выкупляць, бо яны сьвятыя. Кроў іхнюю выльеш на ахвярнік, а тлушч іхні спаліш у агні на мілы пах ГОСПАДУ.
18 Мяса іхняе будзе тваім, таксама грудзіна патрасаная і правая лапатка будуць тваімі.
19 Усе дары сьвятыя, якія прыносяць сыны Ізраіля ГОСПАДУ, Я даю табе, і сынам тваім, і дочкам тваім з табою як пастанову вечную. Гэта вечны запавет солі перад абліччам ГОСПАДА для цябе і насеньня твайго з табою».

20 І сказаў ГОСПАД Аарону: «У зямлі іхняй ня будзеш мець спадчыны і ня будзеш мець між імі
часткі [зямлі]. Я — частка твая і спадчына твая між сынамі Ізраіля.
21 Вось, сынам Левія Я даю як спадчыну ўсе дзесяціны ў Ізраілі за служэньне, якое яны
выконваюць у Намёце Спатканьня.
22 А сыны Ізраіля ня будуць больш набліжацца да Намёту Спатканьня, каб не ўчыніць грэху,
[які вядзе] да сьмерці.
23 [Толькі] лявіты будуць выконваць служэньне ў Намёце Спатканьня, і яны самі будуць несьці
правіну сваю. Гэта пастанова вечная для пакаленьняў вашых. І ня будуць [лявіты] мець
спадчыны між сынамі Ізраіля,
24 бо Я даў лявітам у спадчыну дзесяціны, якія сыны Ізраіля ахвяроўваюць ГОСПАДУ. Дзеля
таго Я сказаў ім: “Між сыноў Ізраіля ня будзеце вы мець спадчыны”».
25 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
26 «Прамоў да лявітаў і скажы ім: “Калі вы атрымаеце дзесяціны ад сыноў Ізраіля, якія Я даў
вам у спадчыну, дзесяціну з дзесяціны маеце прынесьці ў дар ГОСПАДУ.
27 І будзе гэта вам залічана як дар ад збожжа з току або ад таго, што напаўняе тоўчню.
28 І вы таксама павінны складаць ахвяры ГОСПАДУ з усіх дзесяцінаў вашых, якія вы
атрымліваеце ад сыноў Ізраіля; прынясіце іх ГОСПАДУ і [дайце] Аарону сьвятару як дар.
29 З усяго, што атрымліваеце, прыносьце ўсялякія дары ГОСПАДУ, і з усяго найлепшага як
сьвятой часткі гэтага”.
30 І скажы ім: “Калі вы зложыце [з дзесяцінаў] ў ахвяру тлустасьць [дароў], гэта будзе вам
залічана як ахвяра з току і ахвяра з тоўчні.
31 І будзеце гэта есьці на кожным месцы вы і дом ваш, бо гэта плата за службу вашую ў Намёце
Спатканьня.
32 І вы не панясеце на сабе грэху, калі ахвяруеце тлустасьць іхнюю, і не зьняважыце сьвятых
дароў Ізраіля, і не памрацё”».

Лікі 19

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея і Аарона, кажучы:
2 «Вось пастанова Закону, якую загадаў ГОСПАД. Прамоў да сыноў Ізраіля, і няхай яны
прывядуць да цябе рудую карову без заганы, на якую яшчэ не было ўскладанае ярмо.
3 І аддасьцё яе Элеазару сьвятару, і ён выведзе яе па-за табар, і заб’іцё яе перад абліччам
ягоным.
4 І Элеазар сьвятар памочыць палец свой у крыві ейнай, і пакропіць сем разоў крывёю ейнай
пярэдні бок Намёту Спатканьня.
5 І спаляць карову гэтую перад вачыма ягонымі, і скуру ейную, і кроў ейную, і нячыстасьць
ейную спаляць.
6 І возьме сьвятар дрэва кедровае, гізоп і ніткі кармазыновыя, і кіне ў нутро каровы, якая
гарыць у агні.
7 І памые сьвятар шаты свае, і абмые цела сваё ў вадзе, і ўвойдзе ён у табар, і будзе нячысты
сьвятар аж да вечара.
8 І той, хто спальваў карову, памые шаты свае ў вадзе, і абмые цела сваё ў вадзе, і нячысты
будзе ён аж да вечара.
9 І зьбярэ чалавек чысты попел каровы, і высыпе па-за табарам у месцы чыстым, і ён будзе
для грамады сыноў Ізраіля захаваны для [прыгатаваньня] вады ачышчэньня. Гэта [ахвяра] за
грэх.
10 Той, хто зьбіраў попел каровы, вымые адзеньне сваё і будзе нячысты аж да вечара. Гэта
пастанова вечная як для сыноў Ізраіля, так і для прыхадняў, якія ў іх жывуць.
11 Хто дакранецца нябожчыка, будзе нячысты сем дзён.
12 Павінен ён [вадой з попелу каровы] ачысьціцца ў трэці і сёмы дзень, і будзе чысты. Калі ў
трэці дзень і ў сёмы дзень ня будзе ачышчаны, ня будзе чысты.

13 Кожны, хто дакрануўся нябожчыка і не ачысьціўся, робіць нячыстай Сялібу ГОСПАДА; будзе
вынішчана душа тая з Ізраіля, бо вада ачышчэньня не пакрапіла яго, і ён будзе нячысты, і
нячыстасьць ягоная застанецца на ім.
14 Гэта закон адносна чалавека, які памёр у намёце. Кожны, хто ўвойдзе ў гэты намёт, і кожны,
хто ў ім знаходзіцца, будзе нячысты сем дзён.
15 І кожная пасудзіна адкрытая, якая ня мае накрыўкі, прымацаванай на шнурку, будзе
нячыстай.
16 І кожны, хто на абліччы поля дакранецца або забітага мячом, або памёршага, або костак
людзкіх, або магілы, будзе нячысты сем дзён.
17 І возьмуць для нячыстага попел той спаленай [ахвяры] за грэх і нальюць на яго жывой вады
ў посуд.
18 І чалавек чысты возьме гізоп, і памочыць яго ў вадзе, і пакропіць намёт, і ўвесь посуд, і
людзей, якія былі ў ім, і таго, хто дакрануўся костак, або забітага, або памёршага, або магілы.
19 І пакропіць чалавек чысты таго, хто нячысты, у трэці і сёмы дзень, і ачысьціць яго ў сёмы
дзень. Чалавек [нячысты] памые адзеньне сваё і абмые сябе ў вадзе, і вечарам будзе чысты.
20 Але калі той, хто нячысты, ня будзе ачышчаны, будзе зьнішчана душа яго спаміж царквы,
бо ён зрабіў нячыстай Сялібу ГОСПАДА; вадою ачышчэньня ён не абмыты, ён нячысты.
21 Гэта будзе для вас пастанова вечная. І той, хто кропіць вадой ачышчэньня, вымые адзеньне
сваё; і той, хто дакранецца вады ачышчэньня, нячысты будзе аж да вечара.
22 І ўсё, да чаго дакранецца нячысты, і душа, якая яго дакранецца, будзе нячыстай аж да
вечара».

Лікі 20

1 І прыйшлі ў першы месяц сыны Ізраіля, уся грамада, у пустыню Сін, і затрымаўся народ у
Кадэшы. Там памерла Мірыям, і там была пахаваная.
2 І не было вады для грамады, і зграмадзіліся яны супраць Майсея і Аарона.
3 І спрачаўся народ з Майсеем, і яны казалі: «Лепш, каб мы загінулі, калі загінулі браты нашыя
перад абліччам ГОСПАДА!
4 Навошта вывелі вы царкву ГОСПАДА ў пустыню гэтую, каб там загінулі мы і жывёла нашая?
5 Навошта вы нас вывелі з Эгіпту, каб завесьці нас у гэтае месца ліхое, дзе сеяць нельга, дзе
дрэва фігавае не расьце, ані вінаград, ані дрэвы гранатовыя, і вады няма для піцьця?»
6 І Майсей і Аарон адыйшлі ад аблічча царквы да ўваходу ў Намёт Спатканьня, і ўпалі на
абліччы свае. І зьявілася слава ГОСПАДА над імі.
7 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
8 «Вазьмі кій і зьбярыце грамаду, ты і Аарон, брат твой, і прамоўце да скалы перад вачыма
іхнімі, і яна дасьць ваду. І ты выведзеш ваду са скалы, і напоіш грамаду і жывёлу ейную».
9 І ўзяў Майсей кій спрад аблічча ГОСПАДА, як [Госпад] загадаў яму.
10 І Майсей і Аарон сабралі царкву перад скалою, і сказаў [Майсей]: «Слухайце, бунтаўнікі! Ці
зможам мы з гэтай скалы вывесьці ваду для вас?»
11 І падняў Майсей руку сваю, і ўдарыў скалу кіем сваім два разы. І выцякла шмат вады, і
напілася грамада і жывёла іх.
12 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону: «За тое, што вы не паверылі Мне, каб выявіць сьвятасьць
Маю перад вачыма сыноў Ізраіля, вы не ўвядзіцё царкву гэтую ў зямлю, якую Я даў ім».
13 Гэта вось вада Мэрывы, дзе спрачаліся сыны Ізраіля супраць ГОСПАДА і дзе Ён выявіў
сьвятасьць Сваю перад імі.
14 І паслаў Майсей з Кадэшу паслоў да валадара Эдому, каб яны сказалі: «Я — брат твой, Ізраіль:
Ты ведаеш усе беды, якія спаткалі нас.
15 І зыйшлі бацькі нашыя ў Эгіпет, і жылі ў Эгіпце шмат дзён, і Эгіпцяне крыўдзілі нас і бацькоў
нашых,
16 і мы клікалі да ГОСПАДА, і Ён выслухаў голас наш, і паслаў анёла, і вывеў нас з Эгіпту. І вось,
мы ў горадзе Кадэшы, на мяжы тваёй.

17 Просім, дазволь прайсьці праз зямлю тваю. Ня пойдзем мы праз палі і вінаграднікі і ня
будзем піць вады са студняў. Мы пойдзем шляхам валадарскім, не адхіляючыся ані направа,
ані налева, пакуль не мінем межаў тваіх».
18 І сказаў ім Эдом: «Ня пройдзеш праз мяне, бо я з мячом выйду насустрач табе».
19 І сказалі яму сыны Ізраіля: «Мы пойдзем бітаю дарогай, а калі будзем піць ваду тваю, мы і
жывёла наша, заплацім. Нічога не жадаем, толькі прайсьці пехатою».
20 І сказаў [Эдом]: «Ня пройдзеце!» І выйшаў Эдом супраць іх з народам шматлікім і рукою
моцнаю.
21 І забараніў Эдом Ізраілю пераходзіць межы свае, і Ізраіль адыйшоў у бок ад яго.
22 І вырушылі з Кадэшу, і прыйшлі сыны Ізраіля, уся грамада, пад гару Гор.
23 І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону каля гары Гор, якая на мяжы зямлі Эдому, кажучы:
24 «Аарон будзе далучаны да народу свайго, бо ён ня ўвойдзе ў зямлю, якую Я дам сынам
Ізраіля, таму што вы супрацівіліся [слову] з вуснаў Маіх ля водаў Мэрывы.
25 Вазьмі Аарона і Элеазара, сына ягонага, і завядзі іх на гару Гор.
26 Здымі з Аарона адзеньне ягонае, і апрані ў яго Элеазара, сына ягонага, і Аарон няхай
далучыцца [да народу свайго], і памрэ там».
27 І зрабіў Майсей, як загадаў ГОСПАД. І ўзыйшлі яны на гару Гор на вачах усёй грамады.
28 І зьняў Майсей з Аарона адзеньне ягонае, і апрануў у яго Элеазара, сына ягонага. І памёр
Аарон там на вяршыні гары, а Майсей і Элеазар зыйшлі з гары.
29 І ўбачыла ўся грамада, што памёр Аарон, і плакаў увесь дом Ізраіля па Аароне трыццаць
дзён.

Лікі 21

1 І пачуў валадар Араду, Хананеец, які жыў у Нэгеве, што Ізраільцяне ідуць шляхам ад
Атарыму, і напаў ён на Ізраіля, і ўзяў палонных.
2 І шлюбаваў Ізраіль ГОСПАДУ, і сказаў: «Калі Ты, выдаючы, выдасі народ гэты ў рукі нашыя,
мы паложым закляцьце на гарады ягоныя».
3 І выслухаў ГОСПАД голас Ізраіля, і выдаў яму Хананейцаў, і яны палажылі закляцьце на іх і
на гарады іхнія, і назвалі імя месцу гэтаму Харма.
4 І выйшлі яны ад гары Гор шляхам да Мора Чырвонага, каб абыйсьці зямлю Эдом. І ў часе
дарогі душа народу страціла цярплівасьць.
5 І гаварыў народ супраць Бога і супраць Майсея: «Навошта вы вывелі нас з Эгіпту, каб мы
памерлі ў пустыні? Няма хлеба, няма вады. І душы нашай абрыд гэты марны хлеб».
6 І паслаў ГОСПАД на народ палючых зьмеяў, і яны кусалі народ, і памерла шмат народу ў
Ізраілі.
7 І прыйшоў народ да Майсея, і сказаў: «Саграшылі мы, бо гаварылі супраць ГОСПАДА і супраць
цябе. Маліся да ГОСПАДА, каб забраў Ён ад нас гэтых зьмеяў». І маліўся Майсей за народ.
8 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Зрабі [зьмея] палючага і падымі яго як сьцяг. Кожны ўкушаны,
калі гляне на яго, будзе жыць».
9 І зрабіў Майсей зьмея мядзянага, і ўзьняў яго як сьцяг, і сталася, што калі зьмей укусіў
чалавека, а ён глянуў на зьмея мядзянага, дык заставаўся жыць.
10 І выйшлі [ў дарогу] сыны Ізраіля, і сталі табарам у Абоце.
11 І выйшлі з Аботу, і сталі табарам пад Іе-Абарымам у пустыні, якая на ўсход ад Мааву.
12 Адтуль выйшлі і сталі табарам каля ручая Зарэд.
13 Адтуль выйшлі і сталі табарам за [ракою] Арнон, якая цячэ праз пустыню з межаў
Амарэйцаў, бо Арнон — мяжа між Мааўлянамі і Амарэйцамі.
14 Таму сказана ў Кнізе войнаў ГОСПАДА: «Вагэў каля Суфа і ручаёў Арнону.
15 Схіл ручаёў сягае аж да мясцовасьці Ар і прылягае аж да межаў Мааву».
16 Адтуль [рушылі] ў Бээр. Гэта тая студня, пра якую сказаў ГОСПАД Майсею: «Зьбяры народ,
і Я дам яму вады».
17 Тады засьпяваў Ізраіль гэты сьпеў: «Напаўняйся, студня, сьпявайце пра яе!

18 Студня, якую выкапалі князі, начальнікі народу капалі скіпетрамі і кіямі сваімі». З пустыні
яны [вырушылі] ў Матану,
19 з Матаны — у Нахаліэль, з Нахаліэлю — у Бамот,
20 з Бамоту — у лагчыну, якая на полі Мааву, каля вяршыні гары Пісга, што ўзвышаецца перад
абліччам [зямлі] бязьлюднай.
21 І паслаў Ізраіль пасланцоў да Сыгона, валадара Амарэйцаў, кажучы:
22 «Дазволь мне прайсьці праз зямлю тваю; ня збочым мы на палі і на вінаграднікі, ня будзем
піць са студняў, пойдзем шляхам валадарскім, пакуль ня пройдзем межы твае».
23 Але Сыгон не дазволіў Ізраілю прайсьці праз межы свае, і сабраў Сыгон увесь народ свой, і
пераняў Ізраіля ў пустыні, і прыйшоў у Ягцу, і напаў на Ізраіля.
24 І перамог яго Ізраіль вострывам мяча, і заняў зямлю ягоную ад Арнону аж да Ябоку, аж да
[зямлі] сыноў Амона, бо моцнымі былі межы сыноў Амона.
25 І авалодаў Ізраіль усімі гарадамі тымі, і абжыўся Ізраіль у гарадах Амарэйцаў, у Хешбоне і
ў-ва ўсіх ваколіцах ягоных.
26 Хешбон [быў] горадам Сыгона, валадара Амарэйцаў, які ваяваў з папярэднім валадаром
Мааву і забраў з рукі ягонай ўсю зямлю аж да Арнону.
27 Таму гаворыцца ў прыказцы: «Ідзіце ў Хешбон! Няхай будзе адбудаваны і ўмацаваны горад
Сыгона!
28 Бо агонь выйшаў з Хешбону, полымя з гораду Сыгона, спаліў Ар-Мааў і ўладароў узгорышчаў
Арнону.
29 Гора табе, Мааў; прапаў ты, народ Хамоша! Змусіў ён сыноў тваіх да ўцёкаў, а дочак тваіх
[аддаў] у палон Сыгону, валадару Амарэйцаў.
30 Пусьцілі мы [стрэлы] ў іх, загінуў Хешбон аж да Дыбону. Зьнішчылі мы [ўсё] аж да Нофы і
аж да Мэдэвы».
31 І абжыўся Ізраіль у зямлі Амарэйцаў.
32 І паслаў Майсей выведчыкаў у Язэр. І яны здабылі яго і ваколіцы ягоныя, і выгналі
Амарэйцаў, якія [былі] там.
33 І яны павярнулі, і пайшлі па шляху ў Башан. І выйшаў Ог, валадар Башану, насустрач ім на
бітву з усім народам сваім у Эдрэі.
34 І ГОСПАД сказаў Майсею: «Ня бойся яго, бо Я аддаў ў рукі твае яго і ўвесь народ ягоны, і
зямлю ягоную, і ты зробіш з ім так, як зрабіў з Сыгонам, валадаром Амарэйцаў, які жыў у
Хешбоне».
35 І яны пабілі яго і сыноў ягоных, і ўвесь народ ягоны, аж нікога не засталося з іх, і авалодалі
зямлёй ягонай.

Лікі 22

1 І выйшлі сыны Ізраіля, і сталі табарам на раўнінах Мааву на другім баку Ярдану, насупраць
Ерыхону.
2 І ўбачыў Балак, сын Цыпора, усё, што зрабіў Ізраіль Амарэйцам.
3 І Мааў вельмі спалохаўся гэтага народу, бо ён быў шматлікі, і баяўся Мааў сыноў Ізраіля.
4 І сказаў Мааў старшыням Мадыяну: «Цяпер гэтая супольнасьць паесьць усё кругом, як вол
саскубае траву на полі». У той час валадаром Мааву быў Балак, сын Цыпора.
5 І паслаў ён пасланцоў да Білеама, сына Бэора, у Пэтор, які над ракой зямлі сыноў народу
ягонага, каб паклікаць яго, кажучы: «Вось, выйшаў народ з Эгіпту. Вось, ён пакрыў аблічча
зямлі і пасяліўся насупраць мяне.
6 І цяпер прыйдзі, прашу, і пракляні мне народ гэты, бо ён дужэйшы за мяне. Можа, я здолею
перамагчы яго і выгнаць з зямлі, бо ведаю, што каго ты дабраславіш, будзе дабраслаўлёны, а
каго ты праклянеш, будзе пракляты».
7 І прыйшлі старшыні Мааву са старшынямі Мадыяну, і [плата] за прадказаньне была ў руцэ
іхняй, і прыйшлі да Білеама, і перадалі яму словы Балака.
8 І ён сказаў ім: «Застаньцеся тут на ноч, і я прынясу вам слова, якое скажа мне ГОСПАД». І
засталіся князі Мааву ў Білеама.

9 І прыйшоў Бог да Білеама, і сказаў: «Што гэта за людзі ў цябе?»
10 І Білеам сказаў Богу: «Балак, сын Цыпора, валадар Мааву, прыслаў да мяне
11 [сказаць]: “Вось, народ выйшаў з Эгіпту і пакрыў паверхню зямлі. Цяпер прыйдзі і пракляні
мне яго, каб мог я перамагчы яго і выгнаць яго”».
12 І сказаў Бог Білеаму: «Ты ня пойдзеш з імі, не праклянеш народ, бо ён дабраслаўлёны».
13 І ўстаў Білеам раніцаю, і сказаў князям Балака: «Варочайцеся ў зямлю вашую, бо ГОСПАД
не дазволіў мне ісьці з вамі».
14 І ўсталі князі Мааву, і прыйшлі да Балака, і сказалі яму: «Білеам не згадзіўся ісьці з намі».
15 І Балак паслаў яшчэ раз князёў, больш лікам і больш паважаных, чым тыя.
16 І прыйшлі яны да Білеама, і сказалі яму: «Так кажа Балак, сын Цыпора: “Не адмаўляйся,
прашу, прыйсьці да мяне.
17 Бо, ушаноўваючы, вельмі ўшаную цябе і ўсё, што скажаш мне, зраблю. Прыйдзі і пракляні
мне народ гэты”».
18 І адказаў Білеам, і сказаў слугам Балака: «Калі [нават] дасьць мне Балак поўны дом свой
срэбра і золата, не магу парушыць [слова] з вуснаў ГОСПАДА, Бога майго, каб зрабіць што
малое, або вялікае.
19 А цяпер, прашу, застаньцеся таксама ў гэтую ноч, а я даведаюся, што зноў прамовіць да мяне
ГОСПАД».
20 І прыйшоў Бог да Білеама ўначы, і сказаў яму: «Калі прыйшлі гэтыя людзі паклікаць цябе,
устань і ідзі з імі, але слова, якое Я прамоўлю да цябе, выканаеш».
21 І ўстаў Білеам раніцаю, і асядлаў асьліцу сваю і вырушыў разам з князямі Мааву.
22 І ўзгарэўся гнеў Бога, што ён паехаў. І стаў анёл ГОСПАДА на шляху як супраціўнік ягоны.
А ён ехаў на асьліцы сваёй, і два юнакі ягоныя з ім.
23 І ўбачыла асьліца анёла ГОСПАДА, які стаяў на шляху, і меч ягоны выцягнуты ў руцэ ягонай,
і зыйшла асьліца з дарогі, і пайшла ў поле. І Білеам ударыў асьліцу, каб яна завярнула на
дарогу.
24 І стаў анёл ГОСПАДА на сьцежцы паміж вінаграднікамі, і мур быў з таго і з гэтага боку.
25 І ўбачыла асьліца анёла ГОСПАДА, і прыціснулася да муру, і прыціснула нагу Білеама да
муру, і ён зноў пачаў біць яе.
26 І анёл ГОСПАДА перайшоў і стаў у месцы такім вузкім, што не было дарогі, каб абмінуць яго
ані з правага, ані з левага боку.
27 І ўбачыла асьліца анёла ГОСПАДА, і лягла пад Білеамам. І ўзлаваўся Білеам, і біў асьліцу
кіем.
28 І адкрыў ГОСПАД вусны асьліцы, і яна сказала Білеаму: «Што я табе зрабіла? Чаму ты б’еш
мяне ўжо трэці раз?»
29 І сказаў Білеам асьліцы: «Бо ты глумішся з мяне. Каб меў я меч у руцэ маёй, я забіў бы
цябе!»
30 І сказала асьліца Білеаму: «Ці ж я не твая асьліца, на якой ты езьдзіш ад пачатку да
сёньняшняга дня? Ці ж я мела звычку так рабіць з табой?» І ён сказаў: «Не».
31 І адкрыў ГОСПАД вочы Білеама, і ён угледзеў анёла ГОСПАДА, які стаяў на шляху, і меч
выцягнуты ў руцэ ягонай. І пакланіўся ён, і схіліў аблічча сваё.
32 І сказаў яму анёл ГОСПАДА: «Навошта тры разы ты біў асьліцу сваю? Вось, я прыйшоў як
супраціўнік твой, бо нядобрая дарога [твая] перад табою.
33 І ўбачыла мяне асьліца, і тры разы ўхілялася ад мяне, і каб яна не ўхілялася ад мяне, я забіў
бы цябе, а яе пакінуў бы жывую».
34 І сказаў Білеам анёлу ГОСПАДА: «Саграшыў я, бо ня ведаў, што ты стаіш супраць мяне на
шляху; а цяпер, калі гэта кепска ў вачах тваіх, я вярнуся назад».
35 І сказаў анёл ГОСПАДА Білеаму: «Ідзі з тымі людзьмі, але сьцеражыся, бо слова, якое Я
прамоўлю да цябе, прамовіш». І пайшоў Білеам з князямі Балака.
36 І пачуў Балак, што Білеам прыйшоў, і выйшаў яму на спатканьне аж да Ір-Мааву, які на мяжы
пры Арноне.

37 І сказаў Балак Білеаму: «Ці ж, пасылаючы, я не пасылаў да цябе, каб паклікалі цябе? Чаму
ты не прыйшоў да мяне? Няўжо я не магу ўшанаваць цябе?»
38 І сказаў Білеам Балаку: «Вось, я прыйшоў да цябе цяпер. Ці ж я магу што іншае прамовіць?
Слова, якое ўложыць Бог у вусны мае, я прамоўлю».
39 І пайшлі Балак разам з Білеамам, і прыйшлі ў Кірыят-Хуцот.
40 І Балак склаў у ахвяру валоў і авечак, і паслаў Білеаму і князям, якія з ім.
41 І сталася раніцаю, і ўзяў Балак Білеама, і завёў яго на ўзгорышча Баала, і адтуль убачыў ён
частку народу [Ізраіля].

Лікі 23

1 І сказаў Білеам Балаку: «Пастаў мне тут сем ахвярнікаў і падрыхтуй мне сем бычкоў і сем
бараноў».
2 І Балак зрабіў так, як прамовіў Білеам, і склалі ў ахвяру Балак і Білеам бычка і барана на
[кожным] ахвярніку.
3 І сказаў Білеам Балаку: «Застанься каля цэласпаленьня твайго, а я пайду, можа, мяне спаткае
ГОСПАД, і слова, якое Ён мне зьявіць, я паведамлю табе». І ён узыйшоў на лысы ўзгорак.
4 І сустрэў Бог Білеама, і той сказаў Яму: «Паставіў я сем ахвярнікаў, і на кожным ахвярніку
склалі ў ахвяру бычка і барана».
5 І ўлажыў ГОСПАД слова ў вусны Білеама, і сказаў: «Вярніся да Балака і гэта скажы».
6 І вярнуўся [Білеам], і вось, [Балак] стаіць каля цэласпаленьня свайго, ён і ўсе князі Мааву.
7 І абвясьціў ён прароцтва сваё, і сказаў: «З Араму прывёў мяне Балак, валадар Мааву, з гор
усходніх, [кажучы]: “Прыйдзі і пракляні мне Якуба! Прыйдзі і навядзі няшчасьце на Ізраіля!”
8 Як магу я праклінаць таго, каго не праклінае Бог? Як магу навесьці на каго няшчасьце, калі
ГОСПАД не наводзіць яго?
9 Бо я бачу яго з вяршыні скалаў і з узгорышчаў гляджу на яго. Вось, народ, які жыве асобна і
сярод народаў ня лічыцца.
10 Хто можа палічыць пыл Якуба, і лік чацьвёртай часткі Ізраіля? Няхай памрэ душа мая
сьмерцю справядлівых, і няхай будзе канец мой падобны іхняму».
11 І сказаў Балак Білеаму: «Што ты робіш? Я цябе паклікаў праклінаць ворагаў маіх, а ты, вось,
дабраслаўляючы, дабраслаўляеш іх!»
12 І адказаў [Білеам], і сказаў: «Хіба ня тое, што ўложыць ГОСПАД у вусны мае, я павінен
прамаўляць?»
13 І сказаў яму Балак: «Хадзі са мной на іншае месца, з якога толькі частку [Ізраіля] ўбачыш,
а ўсяго ня будзеш бачыць, і адтуль яго пракляні».
14 І завёў ён яго на Поле Вартаўнікоў, на вяршыню Пісгі, і пабудаваў сем ахвярнікаў, і ахвяраваў
на [кожным] ахвярніку бычка і барана.
15 І сказаў [Білеам] Балаку: «Застанься тут каля цэласпаленьня твайго, а я спаткаюся [з
Госпадам]».
16 І сустрэў ГОСПАД Білеама, і ўлажыў словы ў вусны ягоныя, і сказаў: «Вяртайся да Балака і
гэта прамовіш».
17 І вярнуўся [Білеам], і вось, [Балак] стаіць каля цэласпаленьня свайго, і князі Мааву з ім, і
сказаў яму Балак: «Што прамовіў ГОСПАД?»
18 І ён абвясьціў прароцтва сваё, і сказаў: «Устань, Балак, і слухай, і прыхілі вуха, сыне Цыпора!
19 Бог — гэта не чалавек, каб Ён падманваў, і ня сын чалавечы, каб памыляўся. Ці ж Ён кажа і
ня робіць? Ці ж Ён прамовіў і ня споўніў?
20 Вось, дабраслаўляць прывёў Ён мяне, і Ён дабраславіў, і я не стрымаю гэтага.
21 Не заўважна беззаконьня ў Якуба і ня бачна гора ў Ізраіля. ГОСПАД, Бог ягоны, з ім, і гоман
у яго [на славу] валадара ягонага.
22 Бог вывеў яго з Эгіпту. Ён для іх — як рог аднарога.

23 Няма варажбы ў Якуба, ані прадказаньняў у Ізраіля. У свой час будзе сказана Якубу і Ізраілю,
што ўчыніць Бог.
24 Вось, народ, як ільвіца, падымаецца і, як леў, становіцца; ён ня ляжа, пакуль ня зьесьць
здабычы і пакуль не нап'ецца крыві забітых».
25 І сказаў Балак Білеаму: «Калі ты праклёнам не праклянеш яго, дык не дабраслаўляй яго,
дабраслаўляючы!»
26 І адказаў Білеам, і сказаў Балаку: «Ці ж я табе не прамаўляў, кажучы: "Усё тое, што мне
ГОСПАД прамовіць, я зраблю"?»
27 І сказаў Балак Білеаму: «Хадзі, я завяду цябе на іншае месца. Можа, спадабаецца ў вачах
Бога, і ты адтуль праклянеш яго?»
28 І завёў Балак Білеама на вяршыню [гары] Пэор, што ўзвышаецца перад абліччам [зямлі]
бязьлюднай.
29 І сказаў Білеам Балаку: «Пабудуй мне тут сем ахвярнікаў і падрыхтуй мне тут сем бычкоў
і сем бараноў».
30 І зрабіў Балак, як яму сказаў Білеам, і ахвяраваў бычка і барана на [кожным] ахвярніку.

Лікі 24

1 І ўбачыў Білеам, што добра ў вачах ГОСПАДА, каб дабраславіць Ізраіля, і ён не пайшоў, як
раней хадзіў, каб варажыць, але павярнуў аблічча сваё на пустыню.
2 І падняў Білеам вочы свае, і ўбачыў Ізраіля, што стаяў паводле каленаў сваіх, і агарнуў яго
Дух Божы,
3 і абвясьціў ён прароцтва сваё, і сказаў: «Кажа Білеам, сын Бэора, кажа чалавек, у якога
адкрытыя вочы,
4 кажа той, хто чуе слова Божае, той, хто бачыць відзежы Усемагутнага, той, хто падае, але
мае вочы адкрытыя.
5 Якія добрыя намёты твае, Якубе, і сялібы твае, Ізраілю!
6 Раскінуліся яны як даліны рэкаў, як сады на беразе ручая, як альвасы, якія ГОСПАД пасадзіў,
як кедры над водамі.
7 Цячэ вада з нетраў ягоных, і зерне ягонае мае ўдосталь вады. Валадар ягоны мацнейшы за
Агага, і ўзвышаецца валадарства ягонае.
8 Бог вывеў яго з Эгіпту. Ён для яго — як рог аднарога. Праглыне ён народы, прыгнятальнікаў
сваіх, косткі іхнія патрушчыць і праб'е стрэламі сваімі.
9 Ён прыхіліўся, лёг, як леў і як ільвіца. Хто адважыцца пабудзіць яго? Хто дабраслаўляе цябе,
сам будзе дабраслаўлёны; хто праклінае цябе, сам будзе пракляты!»
10 І разгневаўся Балак на Білеама, і пляснуў у далоні свае, і сказаў Балак Білеаму: «Праклінаць
ворагаў маіх я паклікаў цябе. А вось, ты іх ўжо трэці раз, дабраслаўлючы, дабраслаўляеш!
11 Дык цяпер уцякай у месца сваё! Хацеў я цябе, ушаноўваючы, ушанаваць, але вось, ГОСПАД
пазбавіў цябе ўшанаваньня».
12 І сказаў Білеам Балаку: «Ці ж да пасланцоў тваіх, якіх ты паслаў да мяне, я не прамаўляў,
кажучы:
13 “Хоць бы Балак даваў мне поўны дом свой срэбра або золата, не магу працівіцца [слову]
з вуснаў ГОСПАДА, каб што добрае, ці што ліхое ўчыніць з сэрца майго, але тое, што ГОСПАД
прамовіць, я прамаўляць буду”.
14 І цяпер, вось, я іду да народу майго, але падыйдзі, я паведамлю табе, што зробіць народ гэты
з народам тваім у наступныя дні».
15 І абвясьціў ён прароцтва сваё, і сказаў: «Кажа Білеам, сын Бэора, кажа чалавек, які мае
адкрытыя вочы,
16 кажа той, хто чуе словы Божыя, які ведае думку Найвышэйшага і бачыць відзежы
Усемагутнага, які падае, але мае адкрытыя вочы.
17 Бачу яго, але [яшчэ] не цяпер, аглядаю яго, але ня зблізка. Узыходзіць зорка з Якуба, і
паўстае скіпетр з Ізраіля; і ён струшчыць скроні Мааву і зьнішчыць усіх сыноў Сэта.

18 І Эдом станецца ўласнасьцю ягонай, і Сэір станецца ўласнасьцю ворагаў сваіх, а Ізраіль
станецца моцным.
19 Ад Якуба выйдзе той, які мае ўладу, і зьнішчыць ён рэшткі гораду».
20 І ўбачыў ён Амалека, і абвясьціў прароцтва сваё, і сказаў: «Амалек — першы з народаў, але
канец ягоны — загуба».
21 І ўбачыў ён Кенэяў, і абвясьціў прароцтва сваё, і сказаў: «Моцнае жытло тваё, і на скале
пабудаванае гняздо тваё;
22 але будзе на спаленьне Кенэй, калі Асур зьняволіць цябе».
23 І абвясьціў ён прароцтва сваё, і сказаў: «Гора! Хто будзе жыць, калі Бог зробіць гэта?
24 Прыплывуць караблі з Кіттыму, і перамогуць Асура, і перамогуць Эвэра, але ўрэшце самі
загінуць».
25 І ўстаў Білеам, і вярнуўся ў месца сваё, а Балак таксама пайшоў дарогай сваёй.

Лікі 25

1 І жыў Ізраіль у Шыттыме, і народ стаў распусьнічаць з дочкамі Мааву,
2 а яны запрашалі народ складаць ахвяры багам сваім. Разам яны елі і пакланяліся багам іхнім.
3 І прыляпіўся Ізраіль да Баал-Пэора, і ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА супраць Ізраіля.
4 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Зьбяры ўсіх [вінаватых] начальнікаў народу і павесь іх перад
ГОСПАДАМ на сонцы, і адвернецца ярасьць гневу ГОСПАДА ад Ізраіля».
5 І сказаў Майсей судзьдзям Ізраіля: «Забіце тых людзей вашых, якія прыляпіліся да Баал-
Пэора».
6 І вось, адзін з сыноў Ізраіля прыйшоў, і прывёў да братоў сваіх Мадыянку на вачах Майсея і
на вачах усёй грамады сыноў Ізраіля, якія лямантавалі перад уваходам у Намёт Спатканьня.
7 І ўбачыў гэта Пінхас, сын Элеазара, сына Аарона сьвятара, і ўстаў спаміж грамады, і схапіў
дзіду ў руку сваю,
8 і пайшоў за мужчынам Ізраільцянінам пад заслону [намёту], і прабіў іх дзідаю абодвух,
мужчыну Ізраільцяніна і жанчыну, праз улоньні. І спынілася кара на сыноў Ізраіля.
9 А загінула ад той кары дваццаць чатыры тысячы [чалавек].
10 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
11 «Пінхас, сын Элеазара, сына Аарона сьвятара, адвярнуў гнеў Мой ад сыноў Ізраіля, бо ён
загарэўся рэўнасьцю Маёю сярод іх, і Я ня зьнішчыў сыноў Ізраіля ў рэўнасьці Маёй.
12 Дзеля гэтага скажы [яму]: “Вось, Я заключаю з ім Мой запавет супакою”.
13 І будзе гэта яму і насеньню ягонаму запавет вечнага сьвятарства за тое, што ён рупіўся пра
Бога свайго і перамольваў за сыноў Ізраіля».
14 А імя таго мужчыны Ізраільцяніна, забітага разам з Мадыянкай, [было] Зімры, сын Салю,
князь дому бацькоў [калена] Сымона.
15 А імя забітай жанчыныМадыянкі [было] Казьбі, яна —дачка Цура, начальніка аднаго з
пакаленьняў Мадыянскіх.
16 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
17 «Ваюйце супраць Мадыянцаў і выбіце іх,
18 бо яны варожа паставіліся да вас і ашуквалі вас праз Пэора і праз Казьбі, дачку князя
Мадыянскага, сястру іхнюю, забітую ў дзень кары за Пэора».

Лікі 26

1 І сталася пасьля гэтай плягі, і сказаў ГОСПАД Майсею і Элеазару, сыну Аарона сьвятара,
кажучы:
2 «Палічыце лічбу ўсёй грамады сыноў Ізраіля ад дваццаці гадоў і вышэй паводле дамоў
бацькоў іхніх, усіх, здольных да бою».
3 І прамовілі Майсей і Элеазар сьвятар на раўнінах Мааву, насупраць Ерыхону, над Ярданам,
кажучы:
4 «[Палічыце ўсіх] ад дваццаці гадоў і вышэй, як ГОСПАД загадаў Майсею і сынам Ізраіля, якія
выйшлі з зямлі Эгіпецкай».

5 Рубэн, першародны Ізраіля. Сыны Рубэна: Ханох, ад якога сям'я Ханоха, і Пальлю, ад якога
сям'я Пальлю,
6 і Хецрон, ад якога сям'я Хецрона, і Кармі, ад якога сям'я Кармі.
7 Гэта сем'і [пакаленьня] Рубэна, і было палічана іх сорак тры тысячы семсот трыццаць.
8 Сыны Пальлю: Эліяў,
9 а сыны Эліява: Нэмуэль, Датан і Абірам. Датан і Абірам — гэта тыя пакліканыя грамадою,
якія збунтаваліся супраць Майсея і Аарона разам з Карахам, калі яны паднялі бунт супраць
ГОСПАДА,
10 і зямля разьзявіла вусны свае, і праглынула іх і Караха, і паўмірала грамада, калі агонь
спаліў дзьвесьце пяцьдзясят чалавек, і сталіся яны знакам.
11 Але сыны Караха не памерлі.
12 Сыны Сымона паводле сем'яў іхніх: ад Нэмуэля [паходзіць] сям'я Нэмуэля; ад Яміна — сям'я
Яміна; ад Яхіна — сям'я Яхіна,
13 ад Зэраха — сям'я Зэраха; ад Шаўля — сям'я Шаўля.
14 Гэта сем'і [пакаленьня] Сымона, дваццаць дзьве тысячы дзьвесьце.
15 Сыны Гада паводле сем'яў іхніх: Цэфон, ад якога сям'я Цэфона; Хаггі, ад якога сям'я Хаггі;
Шуні, ад якога сям'я Шуні,
16 Озьні, ад якога сям'я Озьні; Эры, ад якога сям'я Эры,
17 Арод, ад якога сям'я Арода; Арыэль, ад якога сям'я Арыэля.
18 Гэта сем'і сыноў Гада, іх палічана сорак тысячаў пяцьсот.
19 Сыны Юды: Ер і Янан, але яны абодва памерлі ў зямлі Ханаан.
20 Вось сыны Юды паводле сем'яў іхніх: Шэля, ад якога сям'я Шэлі; Пэрэс, ад якога сям'я
Пэрэса; Зэрах, ад якога сям'я Зэраха.
21 А вось сыны Пэрэса: Хецрон, ад якога сям'я Хецрона, і Хамуль, ад якога сям'я Хамуля.
22 Гэта сем'і Юды, іх палічана семдзясят шэсьць тысячаў пяцьсот.
23 Сыны Ісахара паводле сем'яў іхніх: Толя, ад якога сям'я Толі; Пува, ад якога сям'я Пувы;
24 Яшуў, ад якога сям'я Яшува; Шымрон, ад якога сям'я Шымрона.
25 Гэта сем'і Ісахара, палічана іх шэсьцьдзясят чатыры тысячы трыста.
26 Сыны Завулёна паводле сем'яў іхніх: Сэрэд, ад якога сям'я Сэрэда; Элён, ад якога сям'я
Элёна; Яхлеэль, ад якога сям'я Яхлеэля.
27 Гэта сем'і Завулёна, палічана іх шэсьцьдзясят тысячаў пяцьсот.
28 Сыны Язэпа паводле сем'яў іхніх: Манаса і Эфраім.
29 Сыны Манасы: Махір, ад якога сям'я Махіра; Махір нарадзіў Гілеада, ад якога сям'я Гілеада.
30 Сыны Гілеада: Езэр, ад якога сям'я Езэра; Хэлек, ад якога сям'я Хэлека;
31 Асрыэль, ад якога сям'я Асрыэля; Мэхем, ад якога сям'я Мэхема,
32 Шэміда, ад якога сям'я Шэміды; Хэфэр, ад якога сям'я Хэфэра.
33 А Цэлафхад, сын Хэфэра, ня меў сыноў, а толькі дочак, а імёны дочак Цэлафхада: Махля,
Ноа, Хогля, Мілька і Тырца.
34 Гэта сем'і Манасы, іх падлічана пяцьдзясят дзьве тысячы семсот.
35 Гэта сыны Эфраіма паводле сем'яў іхніх: Шутэлях, ад якога сям'я Шутэляха; Бэхэр, ад якога
сям'я Бэхэра; Тахан, ад якога сям'я Тахана.
36 А гэта сыны Шэтэляха: Эран, ад якога сям'я Эрана.
37 Гэта сем'і сыноў Эфраіма, палічана іх трыццаць дзьве тысячы пяцьсот. Гэта сыны Язэпа
паводле сем'яў сваіх.
38 Сыны Бэн'яміна паводле сем'яў іхніх: Бэля, ад якога сям'я Бэлі; Ашбэль, ад якога сям'я
Ашбэля; Ахірам, ад якога сям'я Ахірама;
39 Шэфуфам, ад якога сям'я Шэфуфама; Хуфам ад якога сям'я Хуфама.
40 І былі сыны Бэлі: Ард і Нааман; ад Арда [паходзіць] сям'я Арда, ад Наамана — сям'я Наамана.
41 Гэта сыны Бэн'яміна паводле сем'яў сваіх, палічана іх сорак пяць тысячаў шэсьцьсот.
42 Гэта сыны Дана паводле сем'яў іхніх: Шухам, ад якога сям'я Шухама. Гэта сем'і Дана паводле
сем'яў сваіх;

43 усе яны сям'я Шухама, палічана іх шэсьцьдзясят чатыры тысячы чатырыста.
44 Сыны Асэра паводле сем'яў іхніх: Імна, ад якога сям'я Імны; Ішві, ад якога сям'я Ішві; Бэрыя,
ад якога сям'я Бэрыі.
45 Сыны Бэрыі: Хэвэр, ад якога сям'я Хэвэра; і Малькіэль, ад якога сям'я Малькіэля.
46 А імя дачкі Асэра — Сэраха.
47 Гэта сем'і сыноў Асэра, палічана іх пяцьдзясят тры тысячы чатырыста.
48 Сыны Нэфталі паводле сем'яў іхніх: Яхцэль, ад якога сям'я Яхцэля; Гуні, ад якога сям'я Гуні;
49 Ецэр, ад якога сям'я Ецэра; Шылем, ад якога сям'я Шылема.
50 Гэта сем'і Нэфталі паводле сем'яў сваіх, палічана іх сорак пяць тысячаў чатырыста.
51 Гэта лічба сыноў Ізраіля: шэсьцьсот адна тысяча семсот трыццаць.
52 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
53 «Паміж імі будзе падзелена зямля ў спадчыну паводле лічбы імёнаў.
54 Больш шматлікім павялічыш спадчыну іхнюю; менш шматлікім паменшыш спадчыну
іхнюю; кожнаму асобна, паводле сьпісу, будзе дадзена спадчына.
55 Зямля павінна быць падзелена жэрабям, і спадчыну атрымаюць паводле [лічбы] імёнаў у
родах бацькоў іхніх.
56 Жэрабям будзе падзеленая спадчына паміж шматлікімі і малалікімі [сем'ямі]».
57 А гэта лічба лявітаў паводле сем'яў іхніх: Гершон, ад якога сям'я Гершона; Кегат, ад якога
сям'я Кегата; і Мэрары, ад якога сям'я Мэрары.
58 Гэта сем'і Левія: сям'я Лібні, сям'я Хеўрона, сям'я Махлі, сям'я Мушы, сям'я Караха. І Кегат
нарадзіў Амрама.
59 Імя жонкі Амрама — Ёкэбэд, дачка Левія, якая нарадзілася Левію ў Эгіпце. Яна нарадзіла
Амраму Аарона і Майсея, і сястру іхнюю Мірыям.
60 І нарадзіліся Аарону сыны: Надаў, Абігу, Элеазар і Ітамар.
61 Але Надаў і Абігу памерлі, калі прынесьлі чужы агонь перад аблічча ГОСПАДА.
62 І ўсіх было палічана іх дваццаць тры тысячы мужчынаў ад аднаго месяца і вышэй. Яны не
палічаныя сярод сыноў Ізраіля, бо ня дадзена ім спадчына сярод сыноў Ізраіля.
63 Гэта палічаныя Майсеем і Элеазарам сьвятаром, якія палічылі сыноў Ізраіля на раўнінах
Мааву над Ярданам насупраць Ерыхону.
64 Між імі не было нікога з тых, якіх лічылі Майсей і Аарон сьвятар, калі лічылі сыноў Ізраіля
ў пустыні Сынай,
65 бо сказаў ім ГОСПАД, што яны сьмерцю памруць у пустыні, і не застанецца з іх аніводнага,
апрача Халева, сына Ефунны, і Егошуа, сына Нуна.

Лікі 27

1 І наблізіліся дочкі Цэлафхада, сына Хэфэра, сына Гілеада, сына Махіра, сына Манасы, з сям'і
Манасы, сына Язэпа, а імёны іхнія: Махля, Ноа, Хогля, Мілька і Тырца.
2 І сталі яны перад абліччам Майсея і Элеазара сьвятара, і перад абліччам князёў і усёй грамады
каля ўваходу ў Намёт Спатканьня, кажучы:
3 «Бацька наш памёр у пустыні, але ня быў ён сярод грамады, якая сабралася разам з Карахам
супраць ГОСПАДА, бо ён памёр у граху сваім, і не было сыноў у яго.
4 Чаму мае зьнікнуць імя бацькі нашага з сям'і ягонай, бо ня меў ён сына? Дайце нам
уласнасьць паміж братоў бацькі нашага».
5 І прынёс Майсей справу іхнюю перад аблічча ГОСПАДА.
6 І сказаў ГОСПАД Майсею, кажучы:
7 «[Справядліва] дамагаюцца дочкі Цэлафхада. Дай ім уласнасьць, спадчыну паміж братоў
бацькі іхняга, і няхай яны маюць спадчыну бацькі іхняга.
8 А да сыноў Ізраіля прамоў, кажучы: “Калі чалавек памрэ і сына мець ня будзе, спадчына
ягоная пераходзіць на дачку ягоную.
9 Калі ён ня мае дачкі, спадчыну ягоную аддайце братам ягоным.
10 Калі ён ня мае братоў, аддайце спадчыну ягоную братам бацькі ягонага.

11 Калі няма братоў бацькі ягонага, тады спадчына ягоная пераходзіць найбліжэйшаму сваяку
ў сям'і ягонай, і ён возьме спадчыну”. І гэта будзе пастанова для сыноў Ізраіля, прысуд, які
загадаў ГОСПАД Майсею».
12 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Узыйдзі на гару Абарым і паглядзі на зямлю, якую Я дам сынам
Ізраіля.
13 І ты ўбачыш яе, і будзеш далучаны да народу свайго, як быў далучаны Аарон, брат твой,
14 бо вы супрацівіліся [слову] з вуснаў Маіх у пустыні Сін падчас бунту грамады, бо вы не
зьявілі сьвятасьць Маю перад вачыма іхнімі, [даючы ім] вады». Гэта вада Мэрывы каля Кадэшу
ў пустыні Сін.
15 І прамовіў Майсей да ГОСПАДА, кажучы:
16 «Няхай ГОСПАД, Бог духаў і кожнага цела, прызначыць чалавека, які [будзе кіраваць]
грамадой гэтай,
17 і які будзе выходзіць і ўваходзіць перад абліччам іхнім, выводзіць іх і ўводзіць, каб ня
сталася грамада ГОСПАДА як авечкі без пастуха».
18 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вазьмі Егошуа, сына Нуна, чалавека, на якім Дух [Божы]; і
ўскладзі рукі твае на яго.
19 І пастаў яго перад абліччам Элеазара сьвятара і перад абліччам усёй грамады, і перад
вачыма іхнімі пастаў яго [правадыром].
20 І ўладай сваёй падтрымай яго, каб слухала яго ўся грамада сыноў Ізраіля.
21 І стане ён перад абліччам Элеазара сьвятара, а ён пра яго спытаецца перад абліччам
ГОСПАДА праз суд урыму. Паводле [слова] з вуснаў Ягоных будзе выходзіць і ўваходзіць ён
сам, і ўсе сыны Ізраіля з ім, і ўся грамада».
22 І зрабіў Майсей так, як яму загадаў ГОСПАД. І ўзяў Егошуа, і паставіў яго перад абліччам
Элеазара сьвятара і ўсёй грамады,
23 і ўсклаў на яго рукі свае, і паставіў яго [правадыром], як прамовіў ГОСПАД праз Майсея.

Лікі 28

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Загадай сынам Ізраіля і скажы ім: “Няхай пільнуюць, каб у свой час складаць дары ахвярныя
Мне і хлеб Мой, ахвяру агнявую на мілы пах Мне”.
3 І скажаш ім: “Гэта ахвяра агнявая, якую вы павінны складаць ГОСПАДУ: два аднагадовыя
ягняты штодзень у ахвяру цэласпаленьня заўсёды.
4 Адно ягня складзіцё [ў ахвяру] раніцай, а другое складзіцё ўвечары,
5 і дзясятую [частку] эфы пшанічнай мукі, запраўленай чацьвёртай [часткай] гіну най-
чысьцейшага алею як ахвяру хлебную.
6 Гэта цэласпаленьне заўсёднае, якое склалі вы на гары Сынай на мілы пах, ахвяра агнявая
ГОСПАДУ.
7 І як ахвяру вадкую чацьвёртую частку гіну [віна] на кожнае ягня. На сьвятым месцы
вылівайце ахвяру вадкую, сікеру для ГОСПАДА.
8 А другое ягня складзіцё [ў ахвяру] ўвечары, і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую, як раніцаю.
Гэта ахвяра агнявая, мілы пах ГОСПАДУ.
9 А ў дзень суботы [ахвяруеце] двух аднагадовых ягнятаў без заганы і дзьве дзясятыя [эфы]
мукі, запраўленай алеем, як ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую.
10 Гэта суботняя ахвяра цэласпаленьня на кожную суботу, апрача заўсёднай ахвяры
цэласпаленьня і ахвяры вадкай.
11 А ў кожны першы [дзень] вашага месяца складайце ГОСПАДУ ахвяру цэласпаленьня: два
бычкі, аднаго барана і сем аднагадовых ягнят без заганы.
12 На кожнага бычка палажыце тры дзясятыя [эфы] пшанічнай мукі, запраўленай алеем, як
ахвяру хлебную, і на кожнага барана — дзьве дзясятыя [эфы] пшанічнай мукі, запраўленай
алеем, як ахвяру хлебную,

13 і на кожнае ягня як ахвяру хлебную палажыце дзясятую [частку эфы] пшанічнай мукі,
запраўленай алеем. Гэта цэласпаленьне, мілы пах, ахвяра агнявая ГОСПАДУ.
14 І ахвяра вадкая: палова гіну віна на бычка, адна трэцяя гіну на барана і адна чацьвёртая гіну
на ягня. Гэта цэласпаленьне ў кожны першы дзень месяца на [ўсе] месяцы году.
15 І адзін казёл будзе складзены ГОСПАДУ ў ахвяру за грэх, апрача заўсёднай ахвяры
цэласпаленьня і належная ахвяра вадкая.
16 А ў першы месяц, у чатырнаццаты дзень месяца — Пасха ГОСПАДА.
17 У пятнаццаты дзень гэтага месяца будзе сьвята. Сем дзён будзеце есьці [толькі] праснакі.
18 У першы дзень будзе сьвяты сход, ніякай працы, ніякай работы ў той дзень не рабіце.
19 І складзіце ахвяру агнявую, цэласпаленьне ГОСПАДУ: два бычкі, аднаго барана і сем
аднагадовых ягнят без заганы;
20 і ахвяру хлебную з пшанічнай мукі, запраўленай алеем: тры дзясятыя [эфы] на бычка, дзьве
дзясятыя на барана,
21 і адна дзясятая на кожнага з сямі ягнят,
22 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, каб перапрасіць за вас.
23 Апрача ранішняга цэласпаленьня, якое цэласпаленьне заўсёднае, складайце гэтыя
[ахвяры].
24 Такія [ахвяры] будзеце складаць штодзень сем дзён, як спажыву, ахвяру агнявую, мілы
пах ГОСПАДУ. Апрача цэласпаленьня заўсёднага і ахвяры вадкай будуць складацца [гэтыя
ахвяры].
25 А ў дзень сёмы будзе для вас сьвяты сход, ніякай працы, ніякай работы не рабіце.
26 У дзень пяршынаў, калі складаеце ГОСПАДУ ахвяру з новага збожжа ў [сьвята] Тыдняў, будзе
сьвяты сход, і ніякай працы, ніякай работы не рабіце.
27 І складзіце цэласпаленьне на мілы пах ГОСПАДУ: двух бычкоў, аднаго барана і сем
аднагадовых ягнят,
28 і ахвяру хлебную: пшанічную муку, запраўленую алеем; тры дзясятыя [эфы] на аднаго
бычка, дзьве дзясятыя на барана
29 і адна дзясятая на кожнага з сямі ягнят.
30 І аднаго казла, каб перапрасіць за вас.
31 Апрача цэласпаленьня заўсёднага, і ахвяры хлебнай, і ахвяры вадкай, складайце [гэта ў
ахвяру]; ахвяры маюць быць без заганы.

Лікі 29

1 У сёмы месяц, у першы [дзень] месяца будзе ў вас сьвяты сход; ніякай працы, ніякай работы
не рабіце, бо дзень гэты — дзень трубнага гуку.
2 І складзіце цэласпаленьне на мілы пах ГОСПАДУ: аднаго бычка, аднаго барана і сем ягнят
аднагадовых без заганы,
3 і ахвяру хлебную: пшанічную муку, запраўленую алеем; тры дзясятыя [эфы] на бычка, дзьве
дзясятыя на барана,
4 і адну дзясятую на кожнага з сямі ягнят.
5 І аднаго казла ў ахвяру за грэх, каб перапрасіць за вас.
6 Апрача цэласпаленьня на пачатак месяца і яго ахвяры хлебнай і апрача цэласпаленьня
заўсёднага і яго ахвяры хлебнай і ахвяры вадкай, паводле пастановы [складайце іх] на мілы
пах, ахвяру агнявую ГОСПАДУ.
7 У дзясяты [дзень] таго самага сёмага месяца будзе сьвяты сход і будзеце ўпакорваць душы
вашыя; ніякай працы ня будзеце рабіць.
8 І складзіце ў ахвяру цэласпаленьня ГОСПАДУ, на мілы пах аднаго бычка, аднаго барана і сем
аднагадовых ягнят без заганы,
9 і ахвяру хлебную: пшанічную муку, запраўленую алеем; тры дзясятыя [эфы] на бычка, дзьве
дзясятыя на барана,
10 і адну дзясятую на кожнага з сямі ягнят.

11 І аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача ахвяры за грэх дзеля перамольваньня і цэласпаленьня
заўсёднага разам з яго ахвярамі хлебнымі і вадкімі.
12 А ў пятнаццаты дзень сёмага месяца будзе сьвяты сход. Ніякай працы, ніякай работы ня
будзеце рабіць. Будзеце сьвяткаваць сем дзён сьвята ГОСПАДА.
13 І складзіце ў цэласпаленьне, ахвяру агнявую, на мілы пах ГОСПАДУ трынаццаць бычкоў,
двух бараноў, чатырнаццаць ягнят аднагадовых без заганы,
14 і ахвяру хлебную: пшанічную муку, запраўленую алеем, тры дзясятыя [эфы] на аднаго
бычка; дзьве дзясятыя на аднаго барана,
15 і адну дзясятую на кожнага з чатырнаццаці ягнят.
16 І аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
17 У другі дзень [ахвяруеце] дванаццаць бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых
ягнят без заганы,
18 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
19 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
20 У трэці дзень [ахвяруеце] адзінаццаць бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых
ягнят без заганы,
21 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
22 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
23 У чацьвёрты дзень [ахвяруеце] дзесяць бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых
ягнят без заганы,
24 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
25 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
26 У пяты дзень [ахвяруеце] дзевяць бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых ягнят
без заганы,
27 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
28 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
29 У шосты дзень [ахвяруеце] восем бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых ягнят
без заганы,
30 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
31 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
32 У сёмы дзень [ахвяруеце] сем бычкоў, двух бараноў і чатырнаццаць аднагадовых ягнят без
заганы,
33 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
34 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.
35 У восьмы дзень будзе ўрачысты сход; ніякай працы, ніякай работы ня будзеце рабіць.
36 І складзіце цэласпаленьне, ахвяру агнявую на мілы пах ГОСПАДУ: аднаго бычка, аднаго
барана і сем аднагадовых ягнят без заганы,
37 і ахвяру хлебную, і ахвяру вадкую да іх, да бычкоў, бараноў і ягнят, адпаведна да іх лічбы,
паводле пастановы,
38 і аднаго казла ў ахвяру за грэх, апрача цэласпаленьня заўсёднага і яго ахвяраў хлебных і
вадкіх.

39 Гэта маеце складаць ГОСПАДУ пад час сьвятаў вашых, апрача [таго, што ахвяруеце] паводле
шлюбаваньняў вашых і як дабраахвотныя дары на ахвяры цэласпаленьня, на ахвяры хлебныя,
на ахвяры вадкія, і на ахвяры мірныя”».

Лікі 30

1 І сказаў Майсей сынам Ізраіля ўсё, што загадаў ГОСПАД Майсею.
2 І прамовіў Майсей да пакаленьняў Ізраіля, кажучы: «Вось слова, якое загадаў ГОСПАД.
3 Калі [мужчына] паабяцае нешта ГОСПАДУ або зьвяжа сябе прысягай, забавязаўшы душу сваю,
няхай не парушыць словы свае, але ўсё, што выйшла з вуснаў ягоных, зробіць.
4 Калі жанчына паабяцае нешта ГОСПАДУ, або зьвяжа сябе прысягай у доме бацькі свайго і ў
маладосьці сваёй,
5 і пачуе бацька ейны абяцаньне яе і забавязаньне, якім яна зьвязала душу сваю, і не
запярэчыць бацька ейны, усе яе абяцаньні і ўсе яе забавязаньні, якімі яна зьвязала душу сваю,
застануцца.
6 Калі ў той дзень, калі пачуе бацька ейны, ён забароніць ёй гэта, усе абяцаньні яе і ўсе
забавязаньні, якімі яна зьвязала душу сваю, будуць няважныя. ГОСПАД даруе ёй, бо бацька
ейны забараніў ёй.
7 Калі станецца, што выйдзе яна замуж, і яна зьвязаная абяцаньнем або прысягай вуснаў сваіх,
якімі яна зьвязала душу сваю,
8 і калі пачуе муж ейны і, пачуўшы, не запярэчыць, яе абяцаньні і яе забавязаньні, якімі яна
зьвязала душу сваю, застануцца.
9 А калі пачуе муж ейны і забароніць ёй, тады абяцаньні яе, якія на ёй, і прысягі вуснаў яе,
якімі яна зьвязала душу сваю, будуць няважныя; і ГОСПАД даруе ёй.
10 Але абяцаньне ўдавы або разьведзенай, кожнае, якім яна зьвязала душу сваю, застанецца на
ёй.
11 Калі жонка ў доме мужа свайго зьвязала душу сваю абяцаньнем або прысягаю,
12 і пачуе [пра гэта] муж, і будзе маўчаць, і не запярэчыць, тады ўсе абяцаньні і ўсе
забавязаньні, якімі яна зьвязала душу сваю, застануцца на ёй.
13 А калі муж ейны, забараняючы, забароніць ёй, пачуўшы пра гэта, усё, што выйшла вуснаў
яе, яе абяцаньні, якімі яна зьвязала душу сваю, будуць няважныя, бо муж забараніў; і ГОСПАД
даруе ёй.
14 Усе абяцаньні і ўсе прысягі, якімі яна зьвязала душу сваю, муж ейны можа пакінуць і можа
забараніць.
15 А калі муж моўчкі маўчаў з дня на дзень, усе яе абяцаньні і ўсе прысягі застаюцца на ёй,
павінна споўніць, бо [муж] маўчаў, калі пачуў [пра гэта].
16 А калі ён забароніць праз нейкі час пасьля таго, як пачуў, ён сам панясе правіну сваю».
17 Гэта пастановы, якія загадаў ГОСПАД Майсею адносна мужа і жонкі, бацькі і дачкі, калі яна
яшчэ ў юнацтве жыве ў доме бацькі свайго».

Лікі 31

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Помстай адпомсьці за сыноў Ізраіля Мадыянцам, а потым будзеш далучаны да народу
свайго».
3 І прамовіў Майсей да народу, кажучы: «Узбройце спаміж сябе мужчынаў на вайну, і няхай
яны выйдуць супраць Мадыянцаў, і выканаюць помсту ГОСПАДА над Мадыянцамі.
4 [Выбярыце] па тысячы з пакаленьня, з кожнага пакаленьня Ізраіля і пашліце на вайну».
5 І выдзелена было па тысячы з кожнага пакаленьня Ізраіля, дванаццаць тысячаў узброеных
да бою.
6 І паслаў іх Майсей па тысячы з пакаленьня, і Пінхас, сын Элеазара сьвятара, на вайну. І посуд
сьвяты, і трубы [былі] ў руцэ ягонай.
7 І ваявалі яны супраць Мадыянцаў, як загадаў ГОСПАД Майсею, і выбілі ўсіх мужчынаў,

8 і валадароў Мадыяну пазабвалі, акрамя тых, якія загінулі ў бітве: Эвія, Рэкема, Цура, Хура,
Рэву, пяць валадароў Мадыяну; і Білеама, сына Бэора, забілі мячом.
9 І ўзялі ў палон сыны Ізраіля жанчынаў Мадыянскіх і дзяцей іхніх. І ўсю жывёлу іхнюю, і ўсе
статкі іхнія, і ўсю маёмасьць іхнюю забралі,
10 а ўсе гарады іхнія, усе паселішчы іхнія і ўсе мястэчкі іхнія спалілі агнём.
11 І забралі яны здабычу сваю, як людзей, так і жывёлу.
12 І прывялі яны палонных, і здабычу, і нарабаванае да Майсея і Элеазара сьвятара, і да ўсёй
грамады сыноў Ізраіля ў табар на раўнінах Мааву над Ярданам насупраць Ерыхону.
13 І выйшлі Майсей і Элеазар сьвятар, і ўсе князі грамады на сустрэчу ім па-за табар.
14 І загневаўся Майсей на начальнікаў войска, на тысячнікаў і сотнікаў, якія вярталіся з вайны.
15 І сказаў ім Майсей: «Чаму вы пакінулі пры жыцьці ўсіх жанчынаў?
16 Ці ж не яны за намовай Білеама сыноў Ізраіля зрабілі няверными перад ГОСПАДАМ праз
Пэора, і была пляга сярод грамады ГОСПАДА?
17 І цяпер забіце ўсіх дзяцей мужчынскага роду і ўсіх жанчынаў, якія пазналі мужчынаў.
18 А ўсіх дзяўчат, якія не пазналі мужчынаў, пакіньце пры жыцьці.
19 І вы будзеце па-за табарам сем дзён. Усе, хто забіў [душу] або дакрануўся да забітага, мусіць
ачысьціцца ў трэці і ў сёмы дзень, вы і палонныя вашыя.
20 І ўсё адзеньне, і ўсе вырабы са скуры, і ўсё, што зроблена з воўны казінай, і ўсе драўляныя
рэчы будуць ачышчаны».
21 І сказаў Элеазар сьвятар ваярам, якія былі на вайне: «Гэта пастанова закону, якую загадаў
ГОСПАД Майсею.
22 Золата, срэбра, медзь, жалеза, цына, волава
23 і ўсе рэчы, якія могуць прайсьці праз агонь, няхай пройдуць праз агонь і будуць
чыстымі. Тое, што ня можа прайсьці праз агонь, няхай пройдзе праз ваду, і будзе ачышчана
нячыстасьць.
24 І ў сёмы дзень вы памыеце адзеньне вашае, і будзеце ачышчаныя, і ўвойдзеце ў табар».
25 І сказаў ГОСПАД Майсею, кажучы:
26 «Палічыце здабычу, якая здабытая, ад чалавека да жывёлы, ты і Элеазар сьвятар, і галовы
дамоў грамады.
27 І падзеліш здабычу паміж тымі, што ваявалі і выйшлі на вайну, і паміж усёй грамадой.
28 І выдзеліш частку ГОСПАДУ ад ваяроў, якія былі на вайне — адну душу на пяцьсот, як з
людзей, так і з валоў, аслоў і авечак.
29 І з гэтай паловы возьмеш і дасі Элеазару сьвятару як ахвярны дар ГОСПАДУ.
30 А з паловы сыноў Ізраіля вазьмі адну частку з пяцідзесяці: з людзей, валоў, аслоў і авечак, з
усяго быдла, і дасі гэта лявітам, якія служаць пры Сялібе ГОСПАДА».
31 І зрабілі Майсей і Элеазар сьвятар, як загадаў ГОСПАД Майсею.
32 І была здабыча, якую народ здабыў на вайне, — шэсьцьсот семдзясят пяць тысячаў авечак,
33 семдзясят дзьве тысячы валоў,
34 шэсьцьдзясят адна тысяча аслоў,
35 а душаў людзкіх, жанчынаў, якія не пазналі мужчынаў, было разам трыццаць дзьве тысячы.
36 І была палова дадзена тым, якія былі на вайне: трыста трыццаць сем тысячаў пяцьсот
авечак.
37 І была частка ГОСПАДУ з авечак — шэсьцьсот семдзясят пяць авечак.
38 [І было] валоў трыццаць шэсьць тысячаў, а частка ГОСПАДУ [была] семдзясят два [валы].
39 [І было] трыццаць тысячаў пяцьсот аслоў, а частка ГОСПАДУ [была] шэсьцьдзясят адзін
[асёл].
40 [І было] шаснаццаць тысячаў душаў людзкіх, а частка ГОСПАДУ [была] трыццаць дзьве
душы.
41 І аддаў Майсей Элеазару сьвятару частку гэтую як дар ахвярны ГОСПАДУ, як загадаў ГОСПАД
Майсею.
42 А палова для сыноў Ізраіля, якую ўзяў Майсей у ваяроў, [была]:

43 трыста трыццаць сем тысячаў пяцьсот авечак,
44 трыццаць шэсьць тысячаў валоў,
45 трыццаць тысячаў пяцьсот аслоў
46 і шаснаццаць тысячаў душаў людзкіх.
47 І ўзяў Майсей з паловы сыноў Ізраіля адну пяцідзясятую частку з людзей і жывёлы, і аддаў яе лявітам, якія служаць пры Сялібе ГОСПАДА, як загадаў ГОСПАД Майсею.
48 І прыйшлі да Майсея правадыры, начальнікі дружынаў войска, тысячнікі і сотнікі,
49 і сказалі Майсею: «Мы, слугі твае, палічылі ваяроў, якія пад рукой нашай, і не загінуў ніводзін з іх.
50 І прынесьлі мы як дар ахвярны ГОСПАДУ знойдзеныя вырабы з золата: ланцужкі, бранзалеты, пярсьцёнкі, завушніцы і нашыйнікі, каб перапрасіць за душы нашыя перад абліччам ГОСПАДА».
51 І ўзялі Майсей і Элеазар сьвятар золата і ўсе вырабы з яго.
52 І было золата, аддадзенага тысячнікамі і сотнікамі ў ахвяру ГОСПАДУ, шаснаццаць тысячаў семсот пяцьдзясят сыкляў.
53 А кожны з ваяроў меў яшчэ сваю здабычу.
54 І ўзялі Майсей і Элеазар сьвятар золата ад тысячнікаў і сотнікаў, і занесьлі ў Намёт Спатканьня як памятны дар сыноў Ізраіля перад абліччам ГОСПАДА.

Лікі 32

1 А ў сыноў Рубэна і сыноў Гада былі шматлікія статкі, вельмі шматлікія. І яны ўбачылі зямлю Язэр і зямлю Гілеад, і вось, гэта на гадоўлю быдла.
2 І прыйшлі сыны Рубэна і сыны Гада, і сказалі Майсею, і Элеазару сьвятару, і князям грамады, кажучы:
3 «Атарот, Дыбон, Язэр, Німра, Хешбон, Элеале, Сэвам, Нэво і Вэон,
4 зямля, якую здабыў ГОСПАД перад абліччам грамады Ізраіля, зямля для гадоўлі быдла, а слугі твае маюць статкі».
5 І сказалі: «Калі мы знайшлі ласку ў вачах тваіх, дай гэтую зямлю слугам тваім на ўласнасьць, не пераводзь нас праз Ярдан».
6 І сказаў Майсей сынам Гада і сынам Рубэна: «Браты вашыя пойдуць ваяваць, а вы тут будзеце сядзець?
7 Навошта вы стрымліваеце сэрца сыноў Ізраіля, каб яны не перайшлі ў зямлю, якую даў ім ГОСПАД?
8 Так зрабілі бацькі вашыя, калі я паслаў іх з Кадэш-Барнэа выведаць зямлю.
9 І дайшлі яны да даліны Эшколь, і ўбачылі яны зямлю, і збунтавалі яны сэрцы сыноў Ізраіля, каб не ішлі яны ў зямлю, якую даў ім ГОСПАД.
10 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА ў той дзень і Ён прысягнуў, кажучы:
11 “Ня ўбачаць гэтыя людзі, якія выйшлі з Эгіпту ў дваццаць гадоў і вышэй, зямлі, якую Я пад прысягай абяцаў Абрагаму, Ісааку і Якубу, бо яны ня слухаліся Мяне,
12 акрамя Халева, сына Ефунны, Кенэзеяніна, і Егошуа, сына Нуна, бо яны слухаліся ГОСПАДА!”
13 І гневаўся ГОСПАД на Ізраіля, і вадзіў яго па пустыні сорак гадоў, пакуль не памерла ўсё пакаленьне, якое рабіла зло перад вачыма ГОСПАДА.
14 І вось, вы сталі замест бацькоў вашых, людзей грэшных, каб павялічыць лютасьць гневу ГОСПАДА на Ізраіля.
15 Калі зноў адвернецеся ад Яго, зноў Ён будзе вадзіць вас па пустыні, і вы загубіце ўвесь народ гэты».
16 І яны падыйшлі бліжэй да яго, і сказалі: «Мы пабудуем загарадкі для авечак і для статкаў нашых і гарады для дзяцей нашых,
17 а самі, узброеныя, пойдзем хутка перад абліччам сыноў Ізраіля, пакуль не ўвядзём іх у месцы, дзе яны будуць жыць. Дзеці нашыя будуць жыць у гарадах мураваных дзеля [небясьпекі] ад жыхароў зямлі гэтай.
18 Ня вернемся мы ў дамы нашыя, пакуль не авалодаюць сыны Ізраіля спадчынай сваёй.

19 Мы ня будзем шукаць спадчыны з імі на тым баку Ярдану або далей, бо ўжо маем спадчыну
сваю на ўсходнім беразе Ярдану».
20 І Майсей сказаў ім: «Калі ўчыніце паводле слова гэтага, калі ўзброеныя пойдзеце перад
абліччам ГОСПАДА на бітву,
21 і калі кожны з вас, узброены, пяройдзе Ярдан перад абліччам ГОСПАДА, аж пакуль Ён ня
выганіць ворагаў Сваіх перад абліччам Сваім,
22 і будзе здабытая зямля перад абліччам ГОСПАДА, а потым вернецеся, тады ня будзеце
вінаватыя перад ГОСПАДАМ і перад Ізраілем і возьмеце зямлю гэтую на ўласнасьць перад
абліччам ГОСПАДА.
23 А калі ня зробіце так, вы дапусьціцеся грэху перад ГОСПАДАМ, і ведайце, што грэх ваш
знойдзе вас.
24 Дык будуйце гарады дзецям вашым і загарадкі для авечак вашых, і тое, што выйшла з вуснаў
вашых, зрабіце».
25 І сказалі сыны Гада і сыны Рубэна Майсею, кажучы: «Слугі твае зробяць так, як загадаў
гаспадар наш.
26 Дзеці нашыя, жонкі нашыя, статкі нашыя і ўсё быдла нашае застануцца ў гарадах Гілеаду,
27 а слугі твае, усе ўзброеныя, пойдуць перад абліччам ГОСПАДА на вайну, як прамовіў
гаспадар наш».
28 І загадаў Майсей Элеазару сьвятару і Егошуа, сыну Нуна, і галовам дамоў бацькоў сыноў
Ізраіля,
29 і сказаў ім Майсей: «Калі сыны Гада і сыны Рубэна разам з вамі пяройдуць Ярдан, усе
ўзброеныя на бітву перад абліччам ГОСПАДА, і вы завалодаеце зямлёю, дайце ім зямлю Гілеад
на ўласнасьць.
30 А калі ня пойдуць разам з вамі, узброеныя, атрымаюць пасяленьні паміж вас у зямлі
Ханаан».
31 І адказалі сыны Гада і сыны Рубэна, кажучы: «Як прамовіў ГОСПАД да слугаў тваіх, так і
зробім.
32 Мы пойдзем, узброеныя, перад абліччам ГОСПАДА ў зямлю Ханаан, а ўласнасьць нашая,
спадчына нашая з гэтага боку Ярдану».
33 І даў Майсей сынам Гада і Рубэна і палове пакаленьня Манасы, сына Язэпа, валадарства
Сыгона, валадара Амарэйцаў, і валадарства Ога, валадара Башану, зямлю з гарадамі і гарады
зямлі навокал.
34 І адбудавалі сыны Гада Дыбон, Атарот, Араэр,
35 Атрот-Шафан, Язэр і Ёгбэгу,
36 Бэт-Німру і Бэт-Гаран, мураваныя гарады і загарадкі для авечак.
37 А сыны Рубэна адбудавалі Хешбон, Элеале, Кірыятаім,
38 Нэво, Баал-Мэон, зьмяніўшы іх назвы, Сібму, і назвалі імёны гарадоў, якія адбудавалі.
39 І пайшлі сыны Махіра, сына Манасы, у Гілеад, і занялі яго, і выгналі Амарэйцаў, што [жылі]
ў ім.
40 І даў Майсей Гілеад Махіру, сыну Манасы, і ён абжыўся ў ім.
41 А Яір, сын Манасы, пайшоў і заняў мястэчкі [Амарэйцаў], якія назваў Хават-Яір.
42 А Нобах пайшоў і заняў Кенат з ваколіцамі ягонымі, і назваў яго імем сваім, Нобах.

Лікі 33

1 Гэта месцы прыпынку сыноў Ізраіля, якія выйшлі з Эгіпту дружынамі сваімі пад рукою
Майсея і Аарона.
2 І запісаў Майсей месцы табараў, з якіх яны паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА выходзілі. Вось
месцы прыпынку іхняга.
3 У першы месяц, у пятнаццаты дзень першага месяца, у другі дзень Пасхі вырушылі сыны
Ізраіля з Рамсэсу, [ведзеныя] рукой узьнятай на вачах усіх Эгіпцянаў.
4 А Эгіпцяне хавалі ўсіх першародных сваіх, якіх забіў ГОСПАД, і ГОСПАД учыніў суд над багамі
іхнімі.

5 І вырушылі сыны Ізраіля з Рамсэсу, і сталі табарам у Сукоце.
6 І вырушылі з Сукоту, і сталі табарам у Этаме, які на мяжы пустыні.
7 І вырушылі з Этаму, і завярнулі ў Пі-Гахірот, што каля Баал-Цэфону, і сталі табарам перад Мігдолам.
8 І выйшлі з Пі-Гахіроту, і перайшлі сярэдзінай мора ў пустыню, і тры дні ішлі праз пустыню, і сталі табарам у Мары.
9 І вырушылі з Мары, і прыйшлі ў Элім, а ў Эліме [было] дванаццаць крыніцаў водных і семдзясят пальмаў, і там сталі табарам.
10 І вырушылі з Эліму, і сталі табарам каля Мора Чырвонага.
11 І вырушылі ад Мора Чырвонага, і сталі табарам у пустыні Сін.
12 І вырушылі з пустыні Сін, і сталі табарам у Дафцы.
13 І вырушылі з Дафкі, і сталі табарам у Алушы.
14 І вырушылі з Алушы, і сталі табарам у Рэфідыме, і не было там вады для піцьця народу.
15 І вырушылі з Рэфідыму, і сталі табарам у пустыні Сынай.
16 І вырушылі з пустыні Сынай, і сталі табарам у Кіброт-Гатаве.
17 І вырушылі з Кіброт-Гатавы, і сталі табарам у Хацэроце.
18 І врушылі з Хацэроту, і сталі табарам ў Рытме.
19 І вырушылі з Рытмы, і сталі табарам у Рымон-Пэрэсе.
20 І вырушылі з Рымон-Пэрэсу, і сталі табарам у Лібне.
21 І вырушылі з Лібны, і сталі табарам у Рысе.
22 І вырушылі з Рысы, і сталі табарам у Кэгеляце.
23 І вырушылі з Кэгеляты, і сталі табарам на гары Шафэр.
24 І вырушылі з гары Шафэр, і сталі табарам у Харадзе.
25 І вырушылі з Хараду, і сталі табарам у Макэлёце.
26 І вырушылі з Макэлёту, і сталі табарам у Тахаце.
27 І вырушылі з Тахату, і сталі табарам у Тэраху.
28 І вырушылі з Тэраху, і сталі табарам у Мітцы.
29 І вырушылі з Міткі, і сталі табарам у Хашмоне.
30 І вырушылі з Хашмоны, і сталі табарам у Масэроце.
31 І вырушылі з Масэроту, і сталі табарам у Бэнэй-Яакане.
32 І вырушылі з Бэнэй-Яакану, і сталі табарам у Хар-Гагідгадзе.
33 І вырушылі з Хар-Гагідгаду, і сталі табарам у Ётбаце.
34 І вырушылі з Ётбаты, і сталі табарам у Аброне.
35 І вырушылі з Аброны, і сталі табарам у Эцыён-Гебэры.
36 І вырушылі з Эцыён-Гебэру, і сталі табарам у пустыні Сін, у Кадэшы.
37 І вырушылі з Кадэшу, і сталі табарам на гары Гор, на мяжы зямлі Эдому.
38 І ўзыйшоў Аарон сьвятар на гару Гор перад аблічча ГОСПАДА, і там памёр у саракавым годзе пасьля выхаду сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай, у пятым месяцы, у першы дзень месяца.
39 Аарон меў сто дваццаць тры гады, калі памёр на гары Гор.
40 І пачуў валадар Араду, Хананеец, які жыў у Нэгеве ў зямлі Ханаан, што ідуць сыны Ізраіля.
41 А яны вырушылі ад гары Гор і сталі табарам у Цальмоне.
42 І вырушылі з Цальмону, і сталі табарам у Пуноне.
43 І вырушылі з Пунону, і сталі табарам у Абоце.
44 І вырушылі з Аботу, і сталі табарам у Іе-Абарыме на мяжы Мааву.
45 І вырушылі з Іе-Абарыму, і сталі табарам у Дыбон-Гадзе.
46 І вырушылі з Дыбон-Гаду, і сталі табарам у Альмон-Дыблатаіме.
47 І вырушылі з Альмон-Дыблатаіму, і сталі табарам пад гарой Абарым, насупраць Нэво.
48 І вырушылі ад гары Абарым, і сталі табарам на раўнінах Мааву над Ярданам насупраць Ерыхону.
49 І яны сталі табарам паміж Бэт-Гаешымотам і Абэль-Шытымам на раўнінах Мааву.

50 І прамовіў ГОСПАД да Майсея на раўнінах Мааву над Ярданам насупраць Ерыхону, кажучы:
51 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Вы пяройдзеце праз Ярдан у зямлю Ханаан,
52 дык выганіце перад сабою ўсіх жыхароў той зямлі, і паламіце ўсе выявы іхнія, і разьбіце ўсіх ідалаў іхніх, і ўсе ўзгоркі спусташыце.
53 І вы авалодаеце зямлёй, і будзеце жыць на ёй, бо Я даў вам яе на ўласнасьць.
54 Падзяліце зямлю жэрабям паміж сем'ямі вашымі, шматлікай павялічце спадчыну яе, малалікай зьменшыце спадчыну яе. Як жэрабя выпадзе, так будзе падзелена спадчына. Паводле пакаленьняў бацькоў вашых атрымаеце спадчыну.
55 А калі ня выганіце перад сабою жыхароў зямлі гэтай, будуць тыя, якія з іх застануцца, цернямі ў вачах вашых і калючкамі ў баках вашых, і будуць яны ўціскаць вас у зямлі, у якой вы будзеце жыць.
56 І станецца тое, што Я задумаў ім зрабіць, Я вам зраблю”».

Лікі 34

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
2 «Загадай сынам Ізраіля і скажы ім: “Калі ўвойдзеце ў зямлю Ханаан, вось зямля, якая будзе вам у спадчыну, зямля Ханаан у межах ейных.
3 Паўднёвая мяжа будзе ад пустыні Сін да ваколіц Эдому, і будзе паўднёвая мяжа з усходу ад краю Мора Салёнага.
4 І зьверне мяжа вашая на поўдзень да ўзвышша Акраббім, і пойдзе праз Сін на поўдзень да Кадэш-Барнэа, і пойдзе да Хацар-Адару, і дойдзе да Ацмону.
5 Ад Ацмону паверне [мяжа] да ручаю Эгіпецкага і спыніцца на беразе мора.
6 Вашай мяжой заходняй будзе для вас Мора Вялікае, гэта будзе ваша мяжа заходняя.
7 На поўначы будзе ў вас мяжа ад Мора Вялікага пачынаючы і аж да гары Гор,
8 і ад гары Гор павядзіце [мяжу] да ўваходу ў Хамат і далей, да мяжы Цэдаду.
9 І пойдзе мяжа да Зіфрону, і дойдзе да Гацар-Энану. Гэта будзе для вас мяжа паўночная.
10 Усходнюю мяжу правядзіце ад Гацар-Энану да Шэфамы,
11 і ад Шэфамы пойдзе мяжа да Рыўлі на ўсход да Аіну, і зыйдзе мяжа далей, і пройдзе праз горы на ўсход ад мора Кінэрэт,
12 і зыйдзе мяжа ўздоўж Ярдану, і спыніцца пры Моры Салёным. Гэта будзе зямля вашая з межамі сваімі наўкола”».
13 І загадаў Майсей сынам Ізраіля, кажучы: «Вось зямля, якую маеце падзяліць жэрабям і якую загадаў ГОСПАД даць дзевяці пакаленьням і палове пакаленьня.
14 Бо пакаленьне сыноў Рубэна паводле дамоў бацькоў сваіх, і пакаленьне сыноў Гада паводле дамоў бацькоў сваіх, і палова пакаленьня Манасы атрымалі спадчыну сваю.
15 Гэтыя два пакаленьні і палова пакаленьня ўзялі спадчыну сваю з таго боку Ярдану насупраць Ерыхону на ўсход».
16 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
17 «Гэта імёны людзей, якія падзеляць вам зямлю: Элеазар сьвятар і Егошуа, сын Нуна.
18 І возьмеце па адным князі з кожнага пакаленьня, каб падзяліць зямлю на ўласнасьць.
19 Вось імёны тых людзей: з пакаленьня Юды — Халеў, сын Ефунны,
20 з пакаленьня сыноў Сымона — Шэмюэль, сын Амігуда,
21 з пакаленьня Бэн’яміна — Элідад, сын Кісьлёна,
22 з пакаленьня сыноў Дана — Букі, сын Ёглі,
23 з сыноў Язэпа, з пакаленьня сыноў Манасы — Ханіэль, сын Эфода,
24 з пакаленьня сыноў Эфраіма — Кэмуэль, сын Шыфтана,
25 з пакаленьня сыноў Завулёна — Эліцафан, сын Парнаха,
26 з пакаленьня сыноў Ісахара — Пальтыэль, сын Азана,
27 з пакаленьня сыноў Асэра — Эхігуд, сын Шэломіі,
28 з пакаленьня сыноў Нэфталі — Пэдагель, сын Амігуда».

29 Гэта тыя, якім загадаў ГОСПАД падзяліць зямлю Ханаан між сыноў Ізраіля.

Лікі 35

1 І прамовіў ГОСПАД да Майсея на раўнінах Мааву каля Ярдану насупраць Ерыхону, кажучы:
2 «Загадай сынам Ізраіля, каб далі лявітам са спадчыны сваёй гарады, у якіх яны б жылі, і пашы кругом гарадоў дайце лявітам.
3 У гарадах яны будуць жыць, а пашы будуць для быдла іхняга, для статку іхняга і для ўсёй жывёлы іхняй.
4 І будуць пашы гарадоў, якія дасьцё лявітам, ад муроў гарадзкіх на тысячу локцяў наўкола.
5 Адмерайце за горадам дзьве тысячы локцяў з боку ўсходняга, дзьве тысячы локцяў з боку паўднёвага, дзьве тысячы локцяў з боку заходняга і дзьве тысячы локцяў з боку паўночнага, каб сам горад быў пасярэдзіне; гэта будуць пашы вакол тых гарадоў.
6 Гарады, якія дасьцё лявітам, [будуць] шэсьць гарадоў прыбежышча, каб забойца мог у іх схавацца, і апрача іх [яшчэ] сорак два гарады.
7 Усіх гарадоў, якія разам з пашамі дасьцё лявітам, будзе сорак восем.
8 Адносна гарадоў, якія дасьцё са спадчыны сыноў Ізраіля: ад шматлікага [пакаленьня] — большую [лічбу], ад малалікага — меншую. Кожнае [пакаленьне] паводле вялікасьці атрыманай спадчыны дасьць гарады свае лявітам».
9 І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
10 «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім: “Калі пяройдзеце праз Ярдан у зямлю Ханаан,
11 выбярыце сабе гарады, якія будуць для вас прыбежышчам, уцячэ туды забойца, які выпадкова забіў душу.
12 І яны будуць вам гарадамі прыбежышча ад мсьціўцы [за кроў], і забойца не памрэ, пакуль ня стане перад грамадою на суд.
13 А гарадоў, якія дасьцё як гарады прыбежышча, будзе шэсьць.
14 Тры гарады дайце за Ярданам, а тры гарады — у зямлі Ханаан як гарады прыбежышча.
15 Для сыноў Ізраіля і для прыхадняў, і для тых, хто пасяліўся сярод вас, будуць тыя шэсьць гарадоў прыбежышча, каб [мог] у іх уцячы той, хто ненаўмысна забіў душу.
16 Калі чалавек ударыць іншага жалезам, і той памрэ, той, [хто ўдарыў], — забойца; забойца сьмерцю памрэ.
17 Калі чалавек ударыў камянём, якім можна забіць, і забіў, ён — забойца; забойца сьмерцю памрэ.
18 Калі чалавек паленам, якім можна забіць, так ударыў чалавека, што той памёр, ён — забойца, забойца сьмерцю памрэ.
19 Мсьціўца за кроў заб’е забойцу; дзе сустрэне яго, заб'е яго.
20 Калі хто з нянавісьці напаў на чалавека, або кінуў у яго штосьці з намерам забіць, і той памёр,
21 або калі хто ў злосьці ўдарыў рукою сваёй, і той памёр, той, хто ўдарыў, сьмерцю памрэ, бо ён — забойца; і мсьціўца за кроў заб'е яго, калі сустрэне.
22 А калі нехта выпадкова і бяз злосьці ўдарыў чалавека або кінуў у яго нечым ненаўмысна,
23 або, ня бачачы яго, пусьціў у яго камень, які можа забіць, і той памёр, але ён ня быў яго ворагам і ён не хацеў яму зла,
24 тады грамада павінна судзіць паміж тым, які ўдарыў, і мсьціўцам за кроў паводле судоў гэтых.
25 І выратуе грамада забойцу ад рукі мсьціўца за кроў і верне яго грамада ў горад прыбежышча, куды ён уцёк, і ён будзе там жыць да сьмерці сьвятара вялікага, які памазаны сьвятым алеем.
26 Калі ж забойца выйдзе за межы гораду прыбежышча, у які схаваўся,
27 і калі мсьціўца за кроў сустрэне яго па-за межамі гораду прыбежышча, і заб'е мсьціўца за кроў забойцу, ён ня мае [віны] за кроў.
28 Бо да сьмерці сьвятара вялікага павінен забойца быць у горадзе прыбежышча свайго. Пасьля сьмерці сьвятара вялікага можа ён вярнуцца ў зямлю спадчыны сваёй.

29 І будзе гэта для вас пастановай у-ва ўсе пакаленьні вашыя і ў-ва ўсіх месцах пражываньня вашага.
30 Кожны, хто забіў душу, на падставе [словаў] з вуснаў сьведкаў будзе забіты як забойца. Але адзін сьведка ня будзе асуджаць душу на сьмерць.
31 Не бярыце выкупу за душу забойцы, які варты сьмерці; ён сьмерцю памрэ.
32 Не бярыце выкупу за ўцёкшага ў горад прыбежышча, каб яму дазволіць жыць у зямлі сваёй перад сьмерцю першасьвятара.
33 Не паганьце зямлі пражываньня вашага, бо кроў паганіць зямлю, і ніяк ня можа быць перапрошана за кроў, пралітую на зямлю, як толькі праз кроў таго, хто праліў яе.
34 Не рабіце нячыстай зямлю, на якой будзеце жыць, бо Я буду жыць пасярод вас. Бо Я — ГОСПАД, Які жыву пасярод сыноў Ізраіля”».

Лікі 36

1 І прыйшлі галовы бацькоў сем’яў сыноў Гілеада, сына Махіра, сына Манасы, з роду сыноў Язэпа, і расказалі Майсею, і князям, і галовам бацькоў сыноў Ізраіля,
2 і сказалі: «Гаспадару нашаму загадаў ГОСПАД жэрабям падзяліць зямлю паміж сынамі Ізраіля, і гаспадар наш атрымаў загад ГОСПАДА даць спадчыну Цэлафхада, брата нашага, дочкам ягоным.
3 Але калі яны будуць жонкамі аднаго з сыноў іншага калена сыноў Ізраіля, спадчына іхняя адымецца ад спадчыны бацькоў нашых і далучыцца да таго пакаленьня, у якім яны будуць жыць, і наша частка, атрыманая жэрабям, змалее.
4 І калі для сыноў Ізраіля прыйдзе год юбілейны, тады іх спадчына будзе назаўсёды належаць да пакаленьня, да якога яны ўвайшлі, а спадчына пакаленьня бацькоў нашых паменшыцца на спадчыну іхнюю».
5 І загадаў Майсей сынам Ізраіля паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА, кажучы: «Справядлівае слова пакаленьня сыноў Язэпа.
6 Вось слова, якое загадаў ГОСПАД дочкам Цэлафхада, кажучы: "Яны могуць ісьці замуж за таго, хто добры ў вачах іхніх, але за мужчынаў пакаленьня бацькі свайго могуць ісьці замуж.
7 Няхай не пераходзіць спадчына сыноў Ізраіля з аднаго пакаленьня ў другое пакаленьне. Няхай сыны Ізраіля трымаюцца спадчыны пакаленьня бацькоў сваіх.
8 Кожная дзяўчына, якая атрымае спадчыну ў пакаленьні сыноў Ізраіля, стане жонкаю аднаго з мужчынаў пакаленьня бацькоў сваіх, каб сыны Ізраіля захавалі спадчыну бацькоў сваіх,
9 і каб спадчына не пераходзіла з аднаго пакаленьня ў другое пакаленьне. Пакаленьні сыноў Ізраіля павінны трымацца спадчыны сваёй"».
10 Як загадаў ГОСПАД Майсею, так і зрабілі дочкі Цэлафхада,
11 і выйшлі замуж Махля, Тырца, Хогля, Мілька і Ноа, дочкі Цэлафхада, за сыноў дзядзькоў сваіх.
12 Пайшлі яны замуж за [людзей] з сям'і сыноў Манасы, сына Язэпа, і так спадчына іхняя засталася пры пакаленьні сям'і бацькі іхняга.
13 Гэта прыказаньні і прысуды, якія загадаў ГОСПАД праз Майсея сынам Ізраіля на раўнінах Мааву каля Ярдану насупраць Ерыхону.

КНІГА ДРУГАЗАКОНЬНЕ

1 Вось словы, якія прамовіў Майсей да ўсяго Ізраіля за Ярданам у пустыні, у Арабе насупраць
Суфу, паміж Паранам, Тафэлем, Лябанам, Хацэротам і Дызагабам,
2 на адлегласьці ў адзінаццаць дзён [дарогі] ад Харэву праз горы Сэір да Кадэш-Барнэа.
3 І сталася ў саракавым годзе, у адзінаццатым месяцы, у першы [дзень] месяца прамовіў
Майсей да сыноў Ізраіля ўсё, што яму ГОСПАД загадаў сказаць ім.
4 Пасьля перамогі над Сыгонам, валадаром Амарэйцаў, які жыў у Хешбоне, і Огам, валадаром
Башану, які жыў у Аштароце ў Эдрэі,
5 за Ярданам, у зямлі Мааў, пачаў Майсей тлумачыць закон гэты, кажучы:
6 «ГОСПАД, Бог наш, прамовіў да нас на Харэве, кажучы: “Досыць ужо вам быць на гэтай гары.
7 Павярніцеся і выйдзіце, і ідзіце на гару Амарэйцаў і да ўсіх суседзяў іхніх, у Арабу, у горы
і ў даліны, і ў Нэгеў, і на бераг мора, у зямлю Хананейцаў, і ў Лібан, аж да ракі вялікай, ракі
Эўфрат.
8 Глядзіце, Я даў вам гэтую зямлю. Увайдзіце, вазьміце на ўласнасьць зямлю гэтую, якую
запрысяг ГОСПАД даць Абрагаму, Ісааку і Якубу, і насеньню іхняму пасьля іх”.
9 І сказаў я вам у той час: “Не магу я адзін весьці вас;
10 ГОСПАД, Бог ваш, памножыў вас, і вось, сёньня вы шматлікія, як зоркі ў небе.
11 ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, няхай павялічыць вас у тысячу разоў і дабраславіць вас, як Ён
гаварыў вам.
12 Як я адзін панясу патрэбы вашыя, цяжары вашыя і спрэчкі вашыя?
13 Выберыце сабе ў каленах вашых людзей мудрых, разумных і выспрабаваных, і я пастаўлю
іх начальнікамі вашымі”.
14 І адказалі вы мне, і сказалі: “Добрая гэта рэч, якую ты кажаш зрабіць”.
15 І выбраў я тады з начальнікаў каленаў вашых мужоў справядлівых і выспрабаваных, і
паставіў іх начальнікамі над вамі: тысячнікамі, сотнікамі, пяцідзясятнікамі, дзясятнікамі і
загадчыкамі працы для каленаў вашых.
16 І загадаў я судзьдзям вашым, кажучы: “Слухайце справу братоў вашых і судзіце справядліва
між чалавекам і братам ягоным, і прыхаднем.
17 Не глядзіце на аблічча ў судзе, выслухайце як малога, так і вялікага. Ня бойцеся аблічча
чалавека, бо гэта суд Божы. А справу, якая для вас будзе цяжкай, прынясіце да мяне, і я
выслухаю яе”.
18 І я загадаў вам пра ўсе рэчы, якія вы маеце рабіць.
19 І вырушылі мы ад Харэву і прайшлі ўсю пустыню гэтую, вялікую і страшную, якую вы бачылі,
па шляху да гор Амарэйскіх, як загадаў нам ГОСПАД, Бог наш, і прыйшлі ў Кадэш-Барнэа.
20 І я сказаў вам: “Вы прыйшлі да гор Амарэйскіх, якія ГОСПАД, Бог наш, дае нам.
21 Глядзі, ГОСПАД, Бог ваш, даў зямлю перад абліччам вашым, увайдзі і вазьмі яе ў валоданьне,
як сказаў табе ГОСПАД, Бог бацькоў тваіх; ня бойся і не палохайся”.
22 І падыйшлі вы ўсе да мяне, і сказалі: “Пашлём людзей перад абліччам нашым, каб агледзелі
зямлю і паведамілі пра дарогу, якою маем ісьці, і пра гарады, у якія маем увайсьці”.
23 І было добрым у вачах маіх слова гэтае, і я выбраў спаміж вас дванаццаць мужоў, па адным
з кожнага калена.
24 І яны выйшлі, і скіраваліся ў горы, і дайшлі да даліны Эшколь, і агледзелі яе.
25 І ўзялі яны ў рукі свае плады той зямлі, і прынесьлі нам, і паведамілі нам, і сказалі: “Добрая
тая зямля, якую дае нам ГОСПАД, Бог наш”.
26 Але вы не хацелі ісьці і не паслухалі слова ГОСПАДА, Бога нашага.
27 І наракалі ў намётах сваіх, і казалі: “З нянавісьці да нас вывеў нас ГОСПАД з зямлі Эгіпецкай,
каб выдаць нас у рукі Амарэйцаў на загубу.

28 Куды пойдзем? Браты нашыя напалохалі сэрцы нашыя, кажучы: “Народ той шматлікі і
большы за нас, гарады там вялікія і аж у неба ўмацаваныя; і бачылі мы таксама там сыноў
Анака”.
29 І сказаў я вам: “Не дрыжыце і ня бойцеся іх.
30 ГОСПАД, Бог наш, Які ідзе перад намі, будзе ваяваць за нас, як зрабіў Ён у Эгіпце на вачах
нашых,
31 і ў пустыні, дзе ты бачыў, як ГОСПАД, Бог твой, насіў цябе, як носіць чалавек сына свайго,
на ўсім шляху, якім вы ішлі, аж пакуль не прыйшлі вы ў месца гэтае.
32 Але вы так і не паверылі слову ГОСПАДА, Бога вашага,
33 Які ішоў перад вамі ў дарозе, каб шукаць вам месца для табару вашага — ноччу ў агні, каб
асьвятляць вам шлях, якім маеце ісьці, а ўдзень — у воблаку”.
34 І пачуў ГОСПАД голас словаў вашых, і разгневаўся, і прысягнуў, кажучы:
35 “Ня ўбачыць ніводзін чалавек з гэтага пакаленьня ліхога тую добрую зямлю, якую Я
прысягнуў даць бацькам вашым,
36 акрамя Халева, сына Ефунны. Ён яе ўбачыць, яму і сынам яго дам Я зямлю гэтую, па якой
ён хадзіў, бо ён спаўняў [слова] ГОСПАДА”.
37 Таксама на мяне загневаўся ГОСПАД з-за вас, кажучы: “І ты туды ня ўвойдзеш.
38 Егошуа, сын Нуна, які стаіць перад абліччам тваім, ён туды ўвойдзе. Яго падбадзёрвай, бо
ён дасьць Ізраілю ў валоданьне [зямлю].
39 Дзеці вашыя, пра якіх вы гаварылі, што павядуць іх у палон, і сыны вашыя, якія сёньня
не разумеюць, што добрае, а што ліхое, яны ўвойдуць туды; ім Я дам зямлю гэтую, і яны
завалодаюць ёю.
40 А вы павярніце і рушце ў пустыню шляхам да Мора Чырвонага”.
41 І адказалі вы мне, і сказалі: “Саграшылі мы перад ГОСПАДАМ, мы пойдзем і будзем ваяваць,
як загадаў нам ГОСПАД, Бог наш”. І вы перапаясаліся зброяй баявой і адважыліся пайсьці на
гару.
42 І сказаў ГОСПАД мне: “Скажы ім: "Не ўзыходзьце і не ваюйце, бо няма Мяне сярод вас, каб
не пабілі вас ворагі вашыя"”.
43 І я прамаўляў да вас, і вы не паслухалі, і супрацівіліся слову ГОСПАДА, і, гнаныя пыхаю,
узыйшлі на гару.
44 І выйшлі супраць вас Амарэйцы, якія жылі на той гары, і пагналі вас, як робяць пчолы, і білі
вас ад Сэіру аж да Хармы.
45 І вярнуліся вы, і плакалі перад абліччам ГОСПАДА, але ГОСПАД ня выслухаў голасу вашага і
не прыхіліў вуха да вас.
46 І былі вы ў Кадэшы шмат дзён, столькі дзён, колькі там заставаліся.

Друг 2

1 І павярнуліся мы, і рушылі мы ў пустыню шляхам да Мора Чырвонага, як да мяне прамовіў
ГОСПАД, і шмат дзён абыходзілі вакол гару Сэір.
2 І сказаў ГОСПАД мне, кажучы:
3 “Досыць вам хадзіць кругом гары гэтай, Зьвярніце на поўнач.
4 А народу загадай, кажучы: "Вы будзеце праходзіць праз пасяленьні братоў вашых, сыноў
Эзава, якія жывуць у Сэіры, і яны будуць баяцца вас, і вы будзьце вельмі ўважлівыя,
5 не чапайце іх, бо Я ня дам вам зямлі іхняй нават на стапу нагі, таму што гару Сэір Я даў у
валоданьне Эзаву.
6 Ежу купляйце ў іх за срэбра і ешце; таксама ваду купляйце ў іх за срэбра і піце.
7 Бо ГОСПАД, Бог твой, дабраславіў цябе ў кожнай справе рук тваіх. Ён ведае вандроўку
тваю ў гэтай пустыні вялікай. Вось, сорак гадоў ГОСПАД, Бог твой, з табою, і нічога табе не
бракавала"”.
8 І абмінулі мы братоў нашых, сыноў Эзава, якія жылі ў Сэіры, шляхам на Арабу, Элят і Эцыён-
Гэбэр, і завярнулі, і пайшлі шляхам у пустыню Мааў.

9 І сказаў мне ГОСПАД: “Не варагуй супраць Мааву і не пачынай з імі вайны, бо Я ня дам нічога
ў валоданьне табе з зямлі іхняй, бо Я аддаў Ар у валоданьне сынам Лота’ ”.
10 Перад тым жылі ў ёй Эмімы, народ вялікі, шматлікі і высокі, як [сыны] Анака.
11 Лічылі іх Рэфаімамі, як і [сыноў] Анака. А Мааўляне называюць іх Эмімамі.
12 А ў Сэіры жылі раней Харэі, але сыны Эзава выгналі іх, і вынішчылі іх перад абліччам сваім,
і пасяліліся на месцы іхнім, як зрабіў Ізраіль у зямлі спадчыны сваёй, якую даў яму ГОСПАД.
13 “Цяпер уставайце і перайдзіце праз ручай Зарэд”. І перайшлі мы ручай Зарэд.
14 А дзён, калі мы ішлі з Кадэш-Барнэа да ручая Зарэд, было трыццаць восем гадоў, аж пакуль
не згінула ў табары ўсё тое пакаленьне ваяроў, як ім гэта запрысяг ГОСПАД.
15 Таксама рука ГОСПАДА была супраць іх, каб зьнішчыць іх у табары, аж пакуль яны не
загінулі.
16 І сталася, калі згінулі ўсе ваяры, паміраючы сярод народу,
17 прамовіў да мяне ГОСПАД, кажучы:
18 “Ты сёньня пройдзеш Ар, мяжу Мааву,
19 і наблізішся да сыноў Амона. Не чапай іх і не пачынай вайны з імі, бо Я ня дам табе нічога ў
валоданьне з зямлі сыноў Амона, бо Я аддаў [зямлю гэтую] ў валоданьне сынам Лота”.
20 Яна лічылася зямлёй Рэфаімаў; раней жылі ў ёй Рэфаімы, а сыны Амона называлі іх
Замзумімамі.
21 Народ гэта вялікі, шматлікі і высокі ростам, як сыны Анака, і зьнішчыў іх ГОСПАД перад
абліччам [сыноў Амона], і яны пасяліліся на месцы іхнім.
22 Таксама зрабіў ГОСПАД сынам Эзава, якія жывуць у Сэіры, вынішчаючы перад імі Харэяў, і
яны выгналі іх, і самі жывуць на месцы іхнім аж да гэтага дня.
23 І Авімаў, што жылі ў паселішчах аж да Газы, выгубілі Кафтарымы, якія выйшлі з Кафтору, і
пасяліліся на месцы іхнім.
24 “Уставайце, рушце ў дарогу, і пераходзьце ручай Арнон. Вось, Я аддаў у рукі твае Сыгона,
валадара Хешбону, Амарэйца; бяры на ўласнасьць зямлю ягоную, і пачынай вайну супраць
яго.
25 Сёньня Я пачну распаўсюджваць страх і жах перад табою на народы пад усім небам, каб
пачуўшы імя тваё, яны баяліся і дрыжэлі перад табою”.
26 І паслаў я пасланцоў з пустыні Кэдэмот да Сыгона, валадара Хешбону, са словамі мірнымі,
кажучы:
27 “Дазволь мне прайсьці праз зямлю тваю. Я пайду гасьцінцам, ня збочу ані ўправа, ані ўлева.
28 Жыўнасьць продай мне за срэбра, каб я мог есьці. Таксама ваду продай мне за срэбра, каб
я мог піць. Дазволь мне толькі прайсьці пехатою,
29 як дазволілі мне сыны Эзава, якія жывуць у Сэіры, і Мааўляне, якія жывуць у Ары, аж пакуль
я дайду да Ярдану і перайду ў зямлю, якую мае даць нам ГОСПАД, Бог наш”.
30 Але Сыгон, валадар Хешбону, не захацеў дазволіць нам прайсьці праз зямлю ягоную, бо
ГОСПАД, Бог наш, закамяніў дух ягоны і сэрца ягонае зрабіў цьвёрдым, каб аддаць яго ў рукі
твае, як гэта [сталася] сёньня.
31 І сказаў ГОСПАД мне: “Вось, Я пачынаю аддаваць табе Сыгона і зямлю ягоную. Пачынай,
авалодвай, каб успадкаеміць зямлю ягоную”.
32 І выйшаў супраць нас Сыгон, ён і ўвесь народ ягоны, на вайну ў Ягац.
33 І выдаў яго нам ГОСПАД, Бог наш; і пабілі мы яго, і сыноў ягоных, і ўвесь народ ягоны.
34 У той час узялі мы ўсе гарады ягоныя і палажылі закляцьце на кожны горад, на мужчынаў,
і жанчынаў, і дзяцей, нікога з іх не пакінулі,
35 акрамя жывёлы, якую ўзялі сабе, і здабычы з гарадоў, занятых намі.
36 Ад Араэру, які на беразе ручая Арнон, і ад гораду ў даліне аж да Гілеаду не было для нас
гораду, які быў мацнейшы за нас; усё аддаў нам ГОСПАД, Бог наш.
37 Толькі да зямлі сыноў Амона ты не набліжаўся, і да мясцовасьцяў вакол ручая Ябок, да
гарадоў у гарах, і ўсё [было], як загадаў ГОСПАД, Бог наш.

Друг 3

1 І мы зьвярнулі, і пайшлі шляхам на Башан; і выйшаў Ог, валадар Башану, супраць нас, ён і
ўвесь народ ягоны, на вайну ў Эдрэі.
2 І сказаў ГОСПАД мне: “Ня бойся яго, бо Я выдаў у рукі твае яго, і ўвесь народ ягоны, і зямлю
ягоную, і ты зробіш яму тое, што зрабіў Сыгону, валадару Амарэйцаў, які жыў у Хешбоне”.
3 І аддаў ГОСПАД, Бог наш, у рукі нашыя таксама Ога, валадара Башану, і ўвесь народ ягоны, і
вынішчылі мы яго так, што ніхто не ацалеў.
4 І здабылі мы ўсе гарады ягоныя ў той час, і не засталося гораду, які б мы не занялі,
шэсьцьдзясят гарадоў, увесь абшар Аргоб, валадарства Ога ў Башане.
5 Усе гэтыя гарады былі ўмацаваныя мурамі высокімі, і брамамі, і заваламі, ня лічачы
шматлікіх гарадоў адкрытых.
6 І палажылі мы закляцьце на іх, як зрабілі Сыгону, валадару Хешбону, аддаючы закляцьцю
ўсе гарады, мужчынаў, і жанчынаў, і дзяцей,
7 а ўсю жывёлу і здабычу з гарадоў мы пакінулі сабе.
8 І ўзялі мы ў той час зямлю з рук двух валадароў Амарэйскіх, якія жылі за Ярданам, ад ручая
Арнон аж да гары Гермон.
9 Сідонцы называюць Гермон Сырыёнам, а Амарэйцы называюць яго Сэнірам.
10 Усе гарады на раўніне, увесь Гілеад і ўвесь Башан аж да Сальхі і Эдрэі, гарады валадарства
Ога ў Башане,
11 бо Ог, валадар Башану, быў апошні з Рэфаімаў. Вось, дамавіна ягоная, дамавіна жалезная
знаходзіцца ў Раббе сыноў Амона; дзевяць локцяў даўжыня яе, і чатыры локці шырыня яе
меркаю локця чалавечага.
12 І ўзялі мы на ўласнасьць у той час усю зямлю гэтую ад Араэру, які над ручаём Арнон, і палову
гары Гілеад, і гарады іхнія я даў [сынам] Рубэна і Гада.
13 А рэшту Гілеаду і ўвесь Башан, валадарства Ога, я даў палове калена Манасы, увесь абшар
Аргоб. А ўвесь Башан называўся зямлёй Рэфаімаў.
14 Яір, сын Манасы, узяў увесь абшар Аргоб аж да мяжы [сыноў] Гешура і Мааха, і назваў яго
імем сваім. І да сёньня [называюць гэтую частку] Башану Хавот-Яір.
15 А Махіру я даў Гілеад.
16 І [сынам] Рубэна і Гада я даў [зямлю] ад Гілеаду аж да ручая Арнон, сярэдзіну ручая і мяжу,
і аж да ручая Ябок, які ёсьць мяжою сыноў Амона,
17 і Арабу, і Ярдан як мяжу ад Кінэрэту да мора Арабы, Мора Салёнага каля падножжа гары
Пісга на ўсход.
18 І я загадаў вам у гэты час, кажучы: “ГОСПАД, Бог ваш, даў вам зямлю гэтую на ўласнасьць;
а вы ўсе, здатныя да бою, пойдзеце ўзброеныя перад абліччам братоў вашых, сыноў Ізраіля.
19 Толькі жонкі вашыя, дзеці вашыя і статкі вашыя, — бо ведаю, што маеце вялікія статкі, —
застануцца ў гарадах вашых, якія я даў вам,
20 аж пакуль ГОСПАД дасьць супачынак братам вашым, як даў вам, і яны возьмуць на
ўласнасьць зямлю, якую ГОСПАД, Бог ваш, дае вам на тым баку Ярдану; і кожны вернецца
да ўласнасьці сваёй, якую я даў вам”.
21 У той час я загадаў Егошуа, кажучы: “Вочы твае бачылі ўсё, што зрабіў ГОСПАД, Бог ваш,
двум валадарам гэтым. Так зробіць ГОСПАД усім валадарствам, да якіх ты прыйдзеш.
22 Ня бойся іх, бо ГОСПАД, Бог ваш, будзе ваяваць за вас”.
23 І маліў я ў той час ГОСПАДА, кажучы:
24 “Госпадзе ГОСПАДЗЕ, Ты пачаў слузе Твайму аб’яўляць веліч Тваю і руку Тваю магутную.
Які ж бог на небе або на зямлі зрабіў такія справы і чыны магутныя?
25 Дазволь мне, калі ласка, перайсьці і ўбачыць тую добрую зямлю за Ярданам, тыя добрыя
горы і Лібан”.
26 Але разгневаўся ГОСПАД на мяне з-за вас, і ня выслухаў мяне, і сказаў ГОСПАД мне: “Досыць,
больш не гавары Мне пра гэта.

27 Узыйдзі на вяршыню [гары] Пісга і скіруй вочы свае на захад і на поўнач, на поўдзень і на
ўсход, і агледзь вачыма сваімі, бо гэтага Ярдану ты не пяройдзеш.
28 І загадай Егошуа, і падбадзёр яго, і падтрымай яго, бо ён пяройдзе наперадзе народу гэтага
і дасьць Ізраілю ў валоданьне тую зямлю, якую ты ўбачыш”.
29 І былі мы ў даліне насупраць Бэт-Пэору.

Друг 4

1 А цяпер, Ізраіль, слухай пастановы і прысуды, якім я вучу вас, каб, выконваючы іх, вы жылі,
і ўвайшлі, і заваладалі зямлёю, якую ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, дае вам.
2 Не дадавайце [нічога] да таго, што я загадваю вам, і не адымайце ад яго, захоўваючы
прыказаньні ГОСПАДА, Бога вашага, якія я загадваю вам.
3 Вочы вашыя бачылі тое, што зрабіў ГОСПАД у Баал-Пэоры, як ГОСПАД вынішчыў сярод вас
кожнага, хто пайшоў за Баалам.
4 А вы ўсе, якія засталіся пры ГОСПАДЗЕ, Богу вашаму, жывецё аж па сёньня.
5 Вось, я навучыў вас пастановам і прысудам, як загадаў мне ГОСПАД, Бог мой, каб вы так рабілі
ў той зямлі, у якую ўваходзіце, каб атрымаць яе ў валоданьне.
6 Захоўвайце і выконвайце іх, бо ў гэтым мудрасьць вашая і разумнасьць вашая перад вачыма
народаў, якія, чуючы пра ўсе пастановы гэтыя, будуць казаць: "Толькі [такі] народ мудры і
разумны, [як] народ гэты вялікі!"
7 Бо дзе ж ёсьць такі народ вялікі, які б меў так блізкіх сабе багоў, як ГОСПАД, Бог наш, калі мы
Яго клічам?
8 І які ж другі народ такі вялікі, які б меў пастановы і суды праведныя, як увесь гэты закон, які
я сёньня даю вам?
9 Толькі сьцеражыся і пільна захоўвай душу сваю, і не забудзь усіх словаў, якія бачылі вочы
твае, і няхай не адыйдуць яны ад сэрца твайго ў-ва ўсе дні жыцьця твайго, і ты дасі ведаць гэта
сыноў тваіх і сыноў сыноў тваіх.
10 [Памятай] дзень, калі ты стаяў перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, на Харэве, калі
ГОСПАД сказаў мне: "Зьбяры да Мяне народ, няхай пачуюць словы Мае, каб навучыліся баяцца
Мяне ў-ва ўсе дні жыцьця на зямлі і навучылі гэтаму сыноў сваіх".
11 І вы наблізіліся, і стаялі каля падножжа гары, а гара палала агнём аж пад неба, [схаваная] ў
цемры, хмарах і змроку.
12 І прамовіў ГОСПАД да вас з сярэдзіны агню; і гук словаў вы чулі, але па-за голасам нічога ня
бачылі.
13 Ён паведаміў вам запавет Свой, калі загадаў вам выконваць Дзесяць прыказаньняў, і напісаў
іх на двух каменных табліцах.
14 У гэты час загадаў мне ГОСПАД вучыць вас пастановам і прысудам, каб вы іх выконвалі ў
зямлі, якую маеце атрымаць на ўласнасьць.
15 Сьцеражыце моцна душы вашыя, бо ня бачылі вы ў той дзень ніякага вобразу, калі гаварыў
да вас ГОСПАД на [гары] Харэў спасярод агню,
16 каб вы не сапсуліся і не зрабілі сабе ідала, выявы ў выглядзе мужчыны або жанчыны,
17 або ў выглядзе нейкай жывёлы, якая на зямлі, або ў выглядзе птушкі, якая лётае ў небе,
18 або ў выглядзе нейкага паўзуна, які рухаецца па зямлі, або ў выглядзе рыбы, якая плавае ў
вадзе ніжэй зямлі;
19 і каб часам, калі падымеш вочы свае ў неба і ўбачыш сонца, і месяц, і зоркі, і ўсё войска
нябеснае, ты ня быў зьведзены імі і не пачаў пакланяцца ім і служыць ім, бо ГОСПАД, Бог твой,
прызначыў іх усім народам пад небам.
20 А вас выбраў ГОСПАД і вывеў вас з печы жалезнай, з Эгіпту, каб вы сталіся народам Ягоным,
уласнасьцю Ягонай, як гэта ёсьць сёньня.
21 З прычыны словаў вашых разгневаўся ГОСПАД на мяне і прысягнуў, што я не перайду Ярдан
і не ўвайду ў зямлю добрую, якую дае табе ў спадчыну ГОСПАД, Бог твой.

22 Бо я памру ў гэтай зямлі і не перайду праз Ярдан, але вы пяройдзеце [праз яго] і возьмеце
на ўласнасьць гэтую зямлю добрую.
23 Сьцеражыцеся, каб не забыліся вы пра запавет ГОСПАДА, Бога вашага, які заключыў Ён з
вамі, і каб не рабілі вы сабе аніякай выявы, як загадаў табе ГОСПАД, Бог твой,
24 бо ГОСПАД, Бог твой, ёсьць агонь зьнішчальны, Бог зайздросны.
25 Калі вы народзіце сыноў і ўнукаў і дажывяцё да старасьці ў зямлі гэтай, і спаганіцеся, і
зробіце сабе статуі, нейкія выявы, і зробіце тое, што ліхім ёсьць у вачах ГОСПАДА, Бога вашага,
і будзеце гнявіць Яго,
26 я бяру сёньня неба і зямлю за сьведкаў супраць вас, што хутка будзеце выгубленыя з зямлі,
у якую вы пераходзіце праз Ярдан, каб атрымаць яе. Ня будуць доўгімі дні [вашыя] на ёй, бо
зьнішчыць вас [Госпад].
27 І расьцярушыць вас ГОСПАД сярод народаў, і няшмат з вас застанецца сярод народаў, да якіх
выселіць вас ГОСПАД.
28 І там вы будзеце служыць багам, якія зробленыя рукамі людзей, дрэву і камяню, якія ня
бачаць і ня чуюць, не ядуць і ня адчуваюць паху.
29 І там будзеш шукаць ГОСПАДА, Бога твайго, і знойдзеш Яго, калі будзеш шукаць Яго ўсім
сэрцам тваім і ўсёю душою тваёй.
30 У горы тваім спаткаюць цябе ў апошнія дні ўсе гэтыя словы, і ты вернешся да ГОСПАДА, Бога
твайго, і будзеш слухаць голас Ягоны,
31 бо ГОСПАД, Бог твой, — Бог міласэрны, Ён не пакіне цябе, і ня зьнішчыць, і не забудзецца
пра запавет з бацькамі тваімі, які заключыў з імі.
32 Спытайся ў дзён старадаўніх, якія былі перад табой ад дня, калі стварыў Бог чалавека на
зямлі, і ад края неба да края неба, ці было нешта такое, як гэтая справа вялікая, і ці было чутно
пра штосьці падобнае?
33 Ці які народ чуў голас Бога, Які прамаўляў з сярэдзіны агню, які ты чуў, і застаўся жывым?
34 Або ці спрабаваў які бог прыйсьці і выбраць сабе народ спасярод [іншых] народаў праз
выпрабаваньні, знакі, цуды і войны, рукою моцнаю і рамяном узьнятым праз жахі вялікія,
як ўсё, што зрабіў вам ГОСПАД, Бог ваш, у Эгіпце на вачах тваіх?
35 Ты бачыў [гэта], каб даведаўся, што ГОСПАД ёсьць Бог, і акрамя Яго няма іншага.
36 Ён даў табе з неба чуць голас Свой, каб навучыць цябе; на зямлі Ён даў табе ўбачыць агонь
Свой вялікі, і Ты чуў словы Ягоныя з сярэдзіны агню.
37 І Ён палюбіў бацькоў тваіх, і выбраў насеньне іхняе пасьля іх, і вывеў цябе перад абліччам
Сваім з Эгіпту сілаю Сваёю вялікаю,
38 каб выгнаць перад табой народы большыя і мацнейшыя за цябе і каб увесьці цябе ў зямлю
іхнюю, і даць табе яе ў спадчыну, як ты гэта сёньня [бачыш].
39 Дык пераканайся сёньня і вазьмі ў сэрца тваё, што ГОСПАД ёсьць Бог у небе высока і на зямлі
нізка, і няма іншага.
40 І захоўвай пастановы Ягоныя і прыказаньні Ягоныя, якія сёньня я загадваю табе, каб добра
было табе і сынам тваім пасьля цябе і каб былі доўгія дні твае на зямлі, якую ГОСПАД, Бог твой,
дае табе».
41 І вызначыў Майсей тры гарады за Ярданам на ўсход сонца,
42 каб туды мог уцячы забойца, які забіў бліжняга свайго ненаўмысна, і ён ня меў яго ў
нянавісьці ані ўчора, ані пазаўчора, і каб уцёк у адзін з гарадоў гэтых, і застаўся жыць.
43 [Гэта] Бэцэр у пустыні на раўніне для [сыноў] Рубэна, Рамот у Гілеадзе для [сыноў] Гада, і
Галян у Башане для [сыноў] Манасы.
44 Такі вось закон даў Майсей сынам Ізраіля;
45 гэта сьведчаньні, пастановы і прысуды, якія абвясьціў ён сынам Ізраіля пасьля выхаду іхняга
з Эгіпту
46 за Ярданам у даліне насупраць Бэт-Пэору, у зямлі Сыгона, валадара Амарэйцаў, які жыў у
Хешбоне, якога зьнішчыў Майсей і сыны Ізраіля пасьля выхаду з Эгіпту.

47 І завалодалі яны зямлёй ягонай і зямлёй Ога, валадара Башану, двух валадароў Амарэйскіх,
якія жылі за Ярданам на ўсход сонца;
48 ад Араэру, які на беразе ручая Арнон, аж да гары Сырыён, значыць Гермон,
49 і ўсю Арабу за Ярданам на ўсходзе, аж да Мора Арабы каля падножжа гары Пісга.

Друг 5

1 І склікаў Майсей усяго Ізраіля, і сказаў ім: «Слухай, Ізраіль, пастановы і прысуды, якія я
сёньня прамаўляю ў вушы вашыя, каб вы навучыліся ім і каб захоўвалі іх і выконвалі іх.
2 ГОСПАД, Бог наш, заключыў запавет з намі на Харэве.
3 Не з бацькамі нашымі заключыў Ён запавет гэты, але з намі, якія тут сёньня ўсе жывём.
4 Абліччам да аблічча гаварыў з вамі ГОСПАД на гары з сярэдзіны агню.
5 У той час я стаяў між ГОСПАДАМ і вамі, каб вам абвясьціць слова ГОСПАДА, бо вы баяліся
агню і не ўзыйшлі на гару, калі Ён казаў:
6 “Я — ГОСПАД, Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай, з дому няволі.
7 Ня будзеш мець іншых багоў перад абліччам Маім.
8 Не рабі сабе статуі і ніякай выявы таго, што на небе высока і што на зямлі нізка, і што ў вадзе
ніжэй зямлі.
9 Ня будзеш пакланяцца ім і ня будзеш служыць ім, бо Я — ГОСПАД, Бог твой, Бог зайздросны,
Які карае за беззаконьні бацькоў дзяцей да трэцяга і чацьвёртага [пакаленьня] тых, што
ненавідзяць Мяне,
10 і Які чыніць міласэрнасьць тысячам [пакаленьняў] тых, што любяць Мяне і захоўваюць
прыказаньні Мае.
11 Не ўжывай імя ГОСПАДА, Бога твайго, для марноты, бо ГОСПАД не пакіне без пакараньня
таго, хто гаворыць імя Ягонае для марноты.
12 Захоўвай дзень супачынку, каб сьвяціць яго, як загадаў табе ГОСПАД, Бог твой.
13 Шэсьць дзён будзеш працаваць і будзеш рабіць усю работу тваю,
14 а дзень сёмы — супачынак для ГОСПАДА, Бога твайго. Ня будзеш рабіць аніякай работы ты
і сын твой, і дачка твая, і слуга твой, і служка твая, і вол твой, і асёл твой, і ўся жывёла твая, і
прыхадзень, які ў брамах тваіх, каб адпачыў слуга твой і служка твая, як і ты.
15 І памятай, што ты быў нявольнікам у зямлі Эгіпецкай, і што вывеў цябе адтуль ГОСПАД, Бог
твой, рукою моцнаю і рамяном узьнятым, і таму загадаў табе ГОСПАД, Бог твой, адзначаць
дзень супачынку.
16 Шануй бацьку твайго і маці тваю, як загадаў табе ГОСПАД, Бог твой, каб працягнуліся дні
твае і добра табе было на зямлі, якую ГОСПАД, Бог твой, дае табе.
17 Не забівай [як забойца].
18 Не чужалож.
19 Не крадзі.
20 Ня сьведчы супраць бліжняга твайго сьведчаньнем фальшывым.
21 Не жадай жонкі бліжняга твайго, і не жадай ані дому бліжняга твайго, ані поля ягонага, ані
слугі ягонага, ані служкі ягонай, ані вала ягонага, ані асла ягонага, ані нечага з таго, што ў
бліжняга твайго”.
22 Словы гэтыя прамовіў ГОСПАД да ўсёй царквы вашай на гары, з сярэдзіны агню і хмары, і
змроку голасам моцным, і нічога больш не гаварыў; і напісаў гэта на двух табліцах каменных,
якія даў мне.
23 І вось, калі пачулі вы голас спасярод цемры і калі ўбачылі гару, якая гарэла агнём, падыйшлі
да мяне ўсе галовы каленаў вашых і старшыні,
24 і сказалі мне: “Вось, зьявіў нам ГОСПАД, Бог наш, славу Сваю і веліч Сваю. Мы чулі голас
Ягоны з сярэдзіны агню і пераканаліся сёньня, што Бог можа прамовіць да чалавека, і ён
застанецца жывы.
25 Але цяпер навошта мы маем паміраць? Бо праглыне нас гэты агонь вялікі; калі мы яшчэ
будзем слухаць голас ГОСПАДА, Бога нашага, мы паўміраем.

26 Бо хто з тых, якія чулі, як мы, голас Бога Жывога, Які прамаўляе з сярэдзіны агню, і застаўся
жывым?
27 Ты сам падыйдзі і выслухай усё, што скажа ГОСПАД, Бог наш, і ты перакажаш нам усё, што
скажа табе ГОСПАД, Бог наш, і мы выслухаем, і зробім [гэта]".
28 І пачуў ГОСПАД голас словаў вашых да мяне, і сказаў мне ГОСПАД: "Я чуў голас словаў
народу гэтага, што яны казалі табе. Усё добра яны казалі.
29 Хто дасьць ім, каб засталося ў сэрцы іхнім, каб яны баяліся Мяне і захоўвалі ўсе прыказаньні
Мае ўсе дні, каб добра ім было і сынам іхнім на вякі?
30 Ідзі і скажы ім: "Вярніцеся ў намёты вашыя".
31 А ты застанься тут са Мною, і Я скажу табе ўсе прыказаньні, пастановы і прысуды, якім ты
навучыш іх, і яны будуць выконваць іх у зямлі, якую Я дам ім на ўласнасьць".
32 Дык захоўвайце і выконвайце тое, што загадаў вам ГОСПАД, Бог ваш, і не адхіляйцеся ані
ўправа, ані ўлева.
33 У-ва ўсім ідзіце дакладна тым шляхам, які загадаў вам ГОСПАД, Бог ваш, каб вы жылі і былі
шчасьлівыя, і каб доўгімі былі дні вашыя на зямлі, якую атрымаеце.

Друг 6

1 І вось прыказаньні, пастановы і прысуды, якія загадаў ГОСПАД, Бог ваш, каб навучыць вас,
каб вы выконвалі іх у зямлі, у якую вы ідзіцё, каб узяць яе на ўласнасьць,
2 каб ты баяўся ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўваў усе прыказаньні і загады Ягоныя, якія я
загадваю табе, сынам тваім і сынам сыноў тваіх на ўсе дні жыцця твайго, каб даўгавечныя
былі дні твае.
3 Слухай, Ізраіль, і захоўвай, і выконвай іх, каб добра табе было, і ты вельмі памножыўся ў
зямлі, якая ацякае малаком і мёдам, як прамаўляў да цябе ГОСПАД, Бог бацькоў тваіх.
4 Слухай, Ізраіль! ГОСПАД, Бог наш, — ГОСПАД адзіны.
5 Любі ГОСПАДА, Бога твайго, усім сэрцам тваім, усёй душой тваёй і ўсёй моцай тваёю.
6 Гэтыя словы, якія я загадваю табе сёньня, няхай будуць у сэрцы тваім.
7 Паўтарай іх дзецям тваім, гавары іх, седзячы ў доме тваім, ідучы па дарозе, калі засынаеш і
калі прачынаешся.
8 Прывяжы іх як знак да рукі сваёй, няхай будуць яны павязкаю над вачыма тваімі.
9 Напішы іх на дзьвярах дому твайго і на брамах тваіх.
10 Калі ўвядзе цябе ГОСПАД, Бог твой, у зямлю, якую запрысяг бацькам тваім, Абрагаму, Ісааку
і Якубу, калі дасьць табе гарады вялікія і добрыя, якіх ты не будаваў,
11 дамы, поўныя ўсякіх багацьцяў, якіх ты не зьбіраў, выкапаныя студні, якіх ты не капаў,
вінаграднікі і аліўкавыя сады, якіх ты не садзіў, калі будзеш есьці і наясіся,
12 сьцеражыся, каб не забыўся ты пра ГОСПАДА, Які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай, з дому
няволі.
13 ГОСПАДА, Бога твайго, бойся, і Яму служы, і Ягоным імем прысягай.
14 Не ідзі за багамі чужымі, за багамі народаў, якія навакол цябе,
15 бо ГОСПАД, Бог твой, Які ёсьць пасярод цябе, — Бог зайздросны. [Сьцеражыся], каб не
ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА, Бога твайго, на цябе і каб ня сьцёр Ён цябе з аблічча зямлі.
16 Не выпрабоўвайце ГОСПАДА, Бога вашага, як вы выпрабоўвалі ў Масе.
17 Захоўваючы, захоўвайце прыказаньні ГОСПАДА, Бога вашага, і сьведчаньні Ягоныя, і
пастановы Ягоныя, якія Ён загадаў вам;
18 і рабі тое, што належыцца і што добрае ў вачах ГОСПАДА, каб было табе добра і ты ўвайшоў
і ўспадкаеміў зямлю добрую, якую запрысяг ГОСПАД бацькам тваім,
19 каб выгнаў Ён усіх ворагаў тваіх перад абліччам тваім, як прамовіў ГОСПАД.
20 Калі спытаецца цябе ў будучыні сын твой, кажучы: "Што гэта за сьведчаньні, пастановы і
прысуды, якія загадваў вам ГОСПАД, Бог наш?",
21 ты скажаш сыну твайму: "Былі мы нявольнікамі ў фараона ў Эгіпце, але вывеў нас ГОСПАД
з Эгіпту рукою моцнаю,

22 і чыніў цуды і знакі вялікія і жудасныя ў Эгіпце супраць фараона і ўсяго дому ягонага на
вачах нашых,
23 і вывеў нас адтуль, каб увесьці нас у зямлю, якую запрысяг бацькам нашым даць нам.
24 І загадаў нам ГОСПАД, каб мы выконвалі ўсе пастановы гэтыя і баяліся ГОСПАДА, Бога
нашага, і каб добра нам было ўсе дні жыцьця нашага, як [гэта ёсьць] сёньня.
25 І будзе праведнасьць нашая ў тым, што мы будзем захоўваць і выконваць усе прыказаньні
гэтыя перад абліччам ГОСПАДА, Бога нашага, як Ён нам загадаў”.

Друг 7

1 Калі ГОСПАД, Бог твой, увядзе цябе ў зямлю, у якую ідзеш, каб завалодаць ёю, Ён выганіць
перад табой шматлікія народы, Хетаў і Гіргашэяў, Амарэйцаў, Хананейцаў, Пэрэзэяў, Хівеяў і
Евусэяў, сем народаў, большых і дужэйшых за цябе.
2 ГОСПАД, Бог твой, аддасьць іх табе, і ты выгубіш іх, і пакладзеш на іх закляцьце, і не заключыш
з імі запавет, і ня зьлітуешся над імі.
3 Ня будзеш з імі мець сужонстваў; сынам іхнім не аддасі за жонку дачкі сваёй і ня возьмеш ад
іх дачкі для сына свайго,
4 бо яны адцягнуць сыноў тваіх ад Мяне, каб служыць багам чужым. І ўзгарыцца гнеў ГОСПАДА
на вас, і Ён хутка вас зьнішчыць.
5 Але так маеце зрабіць з імі: ахвярнікі іхнія разбурыце, слупы іхнія скрышыце, астартаў іхніх
пасячыце, а статуі спаліце агнём.
6 Бо ты — народ, пасьвячоны ГОСПАДУ, Богу твайму. Цябе выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб быў
ты выбраным народам Ягоным з усіх народаў, якія жывуць на абліччы зямлі.
7 ГОСПАД выбраў вас і ўпадабаў вас не таму, што вы перавышаеце лікам усе народы, бо з усіх
народаў вы найменшыя,
8 але таму, што ГОСПАД любіць вас і захаваў прысягу, якою прысягнуў бацькам вашым, і Ён
вывеў вас рукою моцнаю, і вызваліў вас з дому няволі, з рукі фараона, валадара Эгіпецкага.
9 І ведай, што ГОСПАД, Бог твой, ёсьць Бог, Бог верны, Які захоўвае запавет і міласэрнасьць
тым, якія любяць Яго, і тым, якія захоўваюць прыказаньні Ягоныя, на тысячы пакаленьняў,
10 і аднагароджвае тым, якія ненавідзяць Яго, так, каб зьнішчыць іх, і безадкладна адплочвае
тым, якія ненавідзяць Яго.
11 Дык захоўвай прыказаньні, пастановы і прысуды, якія я сёньня загадваю табе, каб ты
выконваў.
12 Калі вы будзеце слухаць прысуды гэтыя, і захоўваць іх, і выконваць іх, ГОСПАД, Бог твой,
захавае для цябе запавет і міласэрнасьць, якія запрысяг бацькам тваім,
13 і будзе любіць цябе, і дабраславіць цябе, і памножыць, і дабраславіць плод жывата твайго,
і плод зямлі тваёй, і збожжа тваё, збор вінаграду твайго і алею твайго, і нараджэньне быдла
твайго, прыплод авечак тваіх у зямлі, якую запрысяг бацькам тваім, што дасьць табе.
14 Дабраслаўлёны ты будзеш больш за ўсе народы. Ня будзе ў цябе бясплоднага і бясплоднай,
як у людзей, так і ў жывёлы тваёй.
15 Ухіліць ад цябе ГОСПАД усякую немач, і страшныя хваробы Эгіпецкія, якія ты ведаў, не
спашле на цябе, але дасьць іх тым, якія ненавідзяць цябе.
16 Ты выгубіш усе народы, якія дае табе ГОСПАД, Бог твой. Няхай не пашкадуе іх вока тваё, і
ня будзеш служыць багам іхнім, каб ня сталіся яны табе пасткаю.
17 Калі скажаш у сэрцы тваім: “Народы гэтыя большыя лікам за мяне, не змагу іх выгубіць”,
18 ня бойся іх, але памятай, што зрабіў ГОСПАД, Бог твой, фараону і ўсім Эгіпцянам;
19 вялікія кары, якія бачылі вочы твае, і знакі, і цуды, і руку моцную, і рамяно ўзьнятае, якімі
вывеў цябе ГОСПАД, Бог твой. Так зробіць ГОСПАД, Бог твой, усім народам, якіх ты баішся.
20 І спашле на іх ГОСПАД, Бог твой, шэршанёў, пакуль не загінуць тыя, што засталіся, якія
схаваліся перад абліччам тваім.
21 Ня бойся іх, бо ГОСПАД, Бог твой, пасярод цябе, Бог вялікі і страшны.

22 ГОСПАД, Бог твой, будзе прыбіраць народы гэтыя перад табою памалу. Ня зьнішчыць іх
хутка, каб не памножыліся супраць цябе зьвяры палявыя.
23 І аддасьць іх табе ГОСПАД, Бог твой, і будзе іх трывожыць вялікай трывогай, аж пакуль ня
будуць вынішчаныя.
24 У рукі твае аддасьць Ён валадароў іхніх, і ты сатрэш імёны іхнія з-пад неба; ніхто [з іх] не
ўстаіць перад абліччам тваім, пакуль ня выгубіш іх.
25 Выявы багоў іхніх спаліш агнём. Не пажадай срэбра і золата, якое на іх, і не бяры сабе, каб
яно не зьвяло цябе, бо гэта брыдота для ГОСПАДА, Бога твайго.
26 Ніякай брыдоты не ўнясеш у дом твой, і ня будзеш ты закляцьцем, як яно. Пагарджаючы,
будзеш пагарджаць і, брдзячыся, будзеш брыдзіцца гэтым, бо яно заклятае.

Друг 8

1 Усе прыказаньні, якія я загадваю табе сёньня, захоўвайце і выконвайце, каб вы жылі, і
памножыліся, і ўвайшлі, і авалодалі зямлёю, якую запрысяг ГОСПАД бацькам вашым.
2 І памятай увесь шлях, якім вёў цябе ГОСПАД, Бог твой, сорак гадоў праз пустыню, каб
зьмяніць цябе і выспрабаваць цябе, і даведацца, што ў сэрцы тваім, ці будзеш ты захоўваць
прыказаньні Ягоныя, ці не.
3 Ён выпрабоўваў цябе голадам і карміў цябе маннай, якой ня ведаў ты і ня ведалі бацькі
твае, каб даць зразумець табе, што ня толькі хлебам жыве чалавек, але кожным [словам], якое
выходзіць з вуснаў ГОСПАДА, будзе жыць чалавек.
4 Аадзеньне тваё ня нішчылася на табе, і нага твая ня пухла ўсе гэтыя сорак гадоў.
5 Дык зразумей у сэрцы тваім, што як бацька выхоўвае сына свайго, так ГОСПАД, Бог твой,
выхоўваў цябе,
6 і захоўвай прыказаньні ГОСПАДА, Бога твайго, каб хадзіць шляхам Ягоным і мець страх перад
Ім.
7 Бо ГОСПАД, Бог твой, завядзе цябе ў зямлю добрую, зямлю ручаёў і водаў, рэкаў і крыніцаў,
што выбіваюцца ў далінах і на гарах,
8 у зямлю пшаніцы і ячменю, вінаграду і дрэваў фігавых і гранатовых, у зямлю алівак, алею і
мёду,
9 у зямлю, дзе без ніякай нястачы будзеш есьці хлеб і нічога ня будзе бракаваць табе ў ёй; у
зямлю, у якой камяні — жалеза, а з гор ейных будзеш здабываць медзь.
10 І будзеш ты есьці, і насыцішся, і будзеш дабраслаўляць ГОСПАДА, Бога твайго, за зямлю
добрую, якую Ён даў табе.
11 Сьцеражыся, каб не забыўся ты пра ГОСПАДА, Бога твайго, і каб не занядбаў прыказаньні
Ягоныя, прысуды Ягоныя і пастановы Ягоныя, якія я загадваю табе сёньня.
12 Калі наясіся і насыцішся, пабудуеш сабе прыгожыя дамы і ў іх будзеш жыць,
13 і памножыцца быдла тваё і авечкі твае, і памножыцца ў цябе срэбра і золата, і памножыцца
ўсё, што ты маеш,
14 тады ўзганарыцца сэрца тваё і ты забудзешся пра ГОСПАДА, Бога твайго, Які вывеў цябе з
зямлі Эгіпецкай, з дому няволі.
15 Ён правёў цябе праз пустыню вялікую і страшную, у якой былі атрутныя зьмеі і скарпіёны,
зямля сухая і бязводзьдзе. Ён вывеў табе ваду са скалы цьвёрдай,
16 Ён карміў цябе ў пустыні маннай, якой ня ведалі бацькі твае, каб цябе загартаваць і
выспрабаваць цябе, каб даць табе добрае ў будучыні тваёй.
17 І не кажы ў сэрцы тваім: “Сіла мая і моц рукі маёй учынілі ўсё гэтае багацьце для мяне”,
18 але памятай ГОСПАДА, Бога твайго, што Ён даў табе сілы, каб ты здабыў багацьце, што Ён
споўніў запавет Свой, які запрысяг бацькам тваім, як [гэта ёсьць] сёньня.
19 А калі забываючыся, ты забудзешся пра ГОСПАДА, Бога твайго, і пойдзеш за багамі чужымі,
і будзеш ім служыць і будзеш пакланяцца ім, я папярэджваю вас сёньня, што гінучы, загінеце.
20 Як тыя народы, якія ГОСПАД зьнішчыў перад абліччам вашым, так і вы загінеце, калі ня
будзеце слухаць голас ГОСПАДА, Бога вашага.

Друг 9

1 Слухай, Ізраіль, ты сёньня маеш перайсьці праз Ярдан, каб увайсьці і заваладаць народамі
большымі і мацнейшымі за цябе, гарадамі вялікімі і ўмацаванымі аж пад неба,
2 народам вялікім і высокім, сынамі Анака, якіх ты ведаеш і пра якіх ты чуў: "Хто можа
супрацівіцца сынам Анака?"
3 Дык ведай, што сёньня ГОСПАД, Бог твой, пяройдзе перад абліччам тваім, як агонь палючы.
Ён зьнішчыць іх і паваліць іх перад абліччам тваім, і ты хутка выганіш іх і зьнішчыш іх, як
ГОСПАД прамовіў да цябе.
4 Не кажы ў сэрцы тваім, калі ГОСПАД, Бог твой, выганіць іх перад абліччам тваім, кажучы:
“Дзеля праведнасьці маёй увёў мяне ГОСПАД, каб заваладаў я зямлёю гэтаю”, бо дзеля
злачынства народаў гэтых выганяе іх ГОСПАД перад абліччам тваім.
5 Ня дзеля праведнасьці тваёй і ня дзеля шчырасьці сэрца твайго ўваходзіш ты, каб заваладаць
зямлёю іхняй, але за бязбожнасьць народаў гэтых ГОСПАД, Бог твой, выганяе іх перад
абліччам тваім, каб споўніць слова, якое Ён абяцаў бацькам тваім, Абрагаму, Ісааку і Якубу.
6 Дык ведай, што не дзеля праведнасьці тваёй ГОСПАД, Бог твой, даў табе гэтую добрую зямлю
на ўласнасьць, бо ты — народ з цьвёрдым каркам.
7 Памятай і не забывайся, як гнявіў ты ГОСПАДА, Бога твайго, у пустыні. З таго дня, як выйшаў
ты з Эгіпту і аж пакуль прыйшлі ў гэтае месца, вы працівіліся ГОСПАДУ.
8 І на Харэве вы гнявілі ГОСПАДА, і разгневаўся ГОСПАД на вас, і хацеў зьнішчыць вас.
9 Калі я ўзыйшоў на гару, каб атрымаць табліцы каменныя, табліцы запавету, які заключыў
ГОСПАД з вамі, я быў на гары сорак дзён і сорак начэй, ня еў хлеба і ня піў вады.
10 І даў мне ГОСПАД дзьве табліцы каменныя, запісаныя пальцам Бога, на якіх былі ўсе словы,
якія да вас прамовіў ГОСПАД на гары з сярэдзіны агню ў дзень супольнага сходу.
11 Калі мінула сорак дзён і сорак начэй, даў мне ГОСПАД дзьве табліцы каменныя, табліцы
запавету,
12 і сказаў мне ГОСПАД: “Устань і зыйдзі адсюль з гары, бо саграшыў народ твой, які вывеў ты
з Эгіпту; хутка зыйшлі з дарогі, якую Я загадаў ім, і зрабілі сабе ідала”.
13 І сказаў ГОСПАД мне, кажучы: “Бачу гэты народ, і вось, гэта народ з цьвёрдым каркам.
14 Пакінь Мяне! І Я зьнішчу іх, і сатру імя іхняе з-пад неба, а з цябе Я зраблю народ дужэйшы і
большы за гэты”.
15 І я павярнуўся, і зыйшоў з гары, а гара палала агнём, і дьзве табліцы каменныя ў абедзьвух
руках маіх.
16 І я ўбачыў, і вось, вы саграшылі супраць ГОСПАДА, Бога вашага, і зрабілі сабе літае цяля, і
хутка зыйшлі са шляху, які ГОСПАД загадаў вам.
17 І схапіў я абедзьве табліцы, і кінуў іх з рук маіх, і разьбіў іх на вачах вашых.
18 І я ляжаў перад абліччам ГОСПАДА як раней, сорак дзён і сорак начэй, ня еў хлеба і ня піў
вады дзеля ўсіх грахоў вашых, якіх вы дапусьціліся, чынячы зло ў вачах ГОСПАДА, і змусілі
Яго да гневу,
19 бо я баяўся ярасьці і гневу, якім разгневаўся ГОСПАД, каб зьнішчыць вас. І выслухаў мяне
ГОСПАД у гэты раз.
20 І на Аарона быў ГОСПАД надта разгневаны, і хацеў забіць яго, і я маліўся за Аарона ў той час.
21 А грэх ваш, які вы ўчынілі, цяля літае, я, схапіўшы, спаліў агнём, і разьбіў, і сьцёр на дробны
пыл, і кінуў у ручай, які сьцякаў з гары.
22 І ў Табэры, і ў Масе, і ў Кіброт-Гаттаве вы спакушалі ГОСПАДА.
23 І калі пасылаў вас ГОСПАД з Кадэш-Барнэа, кажучы: “Ідзіце і авалодайце зямлёй, якую Я даў
вам”, вы супрацівіліся [слову] з вуснаў ГОСПАДА, Бога вашага, і не паверылі Яму, і не паслухалі
голасу Ягонага.
24 Вы заўсёды працівіліся ГОСПАДУ, ад дня, як я стаў ведаць вас.
25 Сорак дзён і сорак начэй я ляжаў перад абліччам ГОСПАДА і маліў Яго, бо ГОСПАД сказаў,
што зьнішчыць вас.

26 І я маліўся ГОСПАДУ, і казаў: “Госпадзе ГОСПАДЗЕ, не губі народ Твой і спадчыну Тваю, якую
адкупіў Ты веліччу Тваёй, якую Ты вывеў з Эгіпту рукою моцнаю.
27 Памятай слугаў Тваіх, Абрагама, Ісаака і Якуба; і не глядзі на закамянеласьць народу гэтага
і на бязбожнасьць ягоную, і на грахі ягоныя,
28 каб не казалі ў зямлі, з якой Ты вывеў нас: "Ня мог ГОСПАД увесьці іх у зямлю, якую абяцаў
ім. З нянавісьці да іх вывеў Ён іх, каб памерлі ў пустыні".
29 А яны — народ Твой і спадчына Твая, тыя, якіх Ты вывеў сілаю Тваёй вялікаю і рамяном
Тваім узьнятым”.

Друг 10

1 У гэты час сказаў мне ГОСПАД: “Вычашы сабе дзьве табліцы каменныя, падобныя да першых,
і ўзыйдзі да Мяне на гару, і зрабі таксама каўчэг з дрэва.
2 Я напішу на табліцах словы, якія былі на першых табліцах, якія ты разьбіў, і ты ўложыш іх у
каўчэг”.
3 І я зрабіў каўчэг з дрэва акацыі, і вычасаў дзьве табліцы каменныя, падобныя да першых, і
ўзыйшоў на гару, [маючы] ў руках дзьве табліцы.
4 І напісаў [Госпад] на табліцах падобна, як раней напісаў, Дзесяць Словаў, якія прамовіў
ГОСПАД на гары з сярэдзіны агню ў дзень супольнага сходу. І даў мне іх ГОСПАД.
5 І я разьвярнуўся, і зыйшоў з гары, і палажыў табліцы ў каўчэг, які зрабіў; і яны засталіся там,
як мне загадаў ГОСПАД.
6 А сыны Ізраіля выйшлі з Бээроту сыноў Яакана ў Масэру. Там памёр Аарон і быў пахаваны, а
Элеазар, сын ягоны, стаў сьвятаром замест яго.
7 Адтуль мы прыйшлі ў Гудгоду, а з Гудгоды — у Ётбату, у зямлю ручаёў водных.
8 У гэты час ГОСПАД аддзяліў калена Левія, каб яны насілі Каўчэг Запавету ГОСПАДА і каб стаялі
перад абліччам ГОСПАДА і служылі Яму, і дабраслаўлялі ў імя Ягонае па сёньняшні дзень.
9 Дзеля таго Левій ня мае часткі [зямлі], ані спадчыны паміж братоў сваіх, бо спадчына ягоная
— ГОСПАД, як прамовіў да яго ГОСПАД, Бог твой.
10 І я стаяў на гары, як у ранейшыя дні, сорак дзён і сорак начэй, і таксама ў гэты раз выслухаў
мяне ГОСПАД, і не захацеў ГОСПАД выгубіць цябе.
11 І сказаў ГОСПАД мне: “Устань, ідзі і ачольвай народ, каб яны пайшлі і заваладалі зямлёй,
якую Я запрысяг бацькам іхнім, каб даць ім”.
12 І цяпер, Ізраіль, чаго жадае ад цябе ГОСПАД, Бог твой? Каб ты баяўся ГОСПАДА, Бога твайго,
і хадзіў усімі шляхамі Ягонымі, любіў Яго і служыў ГОСПАДУ, Богу твайму, усім сэрцам тваім
і ўсёй душою тваёй,
13 каб выконваў ты прыказаньні ГОСПАДА і пастановы Ягоныя, якія я сёньня загадваю табе,
каб добра [было] табе.
14 Вось, ГОСПАДУ, Богу твайму, належыць неба і нябёсы нябёсаў, зямля і ўсё, што на ёй.
15 Толькі да бацькоў тваіх прыхінуўся ГОСПАД і палюбіў іх, і выбраў насеньне іхняе пасьля іх,
выбраў вас з усіх народаў, як [гэта ёсьць] сёньня.
16 Дык абрэжце скуравінку сэрца вашага і не рабіце больш цьвёрдым карку вашага,
17 бо ГОСПАД, Бог ваш, — Бог багоў і Госпад гаспадароў, Бог вялікі, магутны і страшны, Які не
глядзіць на аблічча, і не бярэ падарункі.
18 Ён дае суд сіраце і ўдаве, і любіць прыхадня, даючы яму хлеб і адзеньне.
19 І вы любіце прыхадня, бо і вы былі прыхаднямі ў зямлі Эгіпецкай.
20 ГОСПАДА, Бога твайго, бойся, Яму служы, да Яго туліся і на імя Ягонае прысягай.
21 Ён — хвала твая і Бог твой, Ён учыніў дзеля цябе вялікія і жудасныя [рэчы], якія бачылі вочы
твае.
22 [Маючы] семдзясят душаў, зыйшлі бацькі твае ў Эгіпет, а цяпер памножыў цябе ГОСПАД,
Бог твой, як зоркі ў небе.

Друг 11

1 Любі ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўвай загады Ягоныя, і пастановы Ягоныя, і прысуды Ягоныя,
і прыказаньні Ягоныя ўсе дні.
2 І вы ведаеце сёньня тое, чаго ня ведаюць сыны вашыя, якія ня бачылі караньня ГОСПАДА,
Бога вашага, велічы Ягонай, і моцнай рукі Ягонай, і ўзьнятага рамяна Ягонага,
3 знакаў Ягоных і справаў Ягоных, якія Ён учыніў у Эгіпце над фараонам, валадаром Эгіпту, і
над усёй зямлёй ягонай,
4 і што зрабіў Ён з усім войскам Эгіпецкім, конямі ягонымі і калясьніцамі ягонымі; калі
нахлынулі на іх воды Мора Чырвонага перад абліччам іхнім, калі яны гналіся за вамі, і
зьнішчыў іх ГОСПАД, і так ёсьць да сёньняшняга дня,
5 і што Ён зрабіў для вас у пустыні, пакуль вы не прыйшлі на месца гэтае,
6 і што Ён зрабіў Датану і Абіраму, сынам Эліява, сына Рубэна, якіх праглынула зямля,
адкрыўшы пашчу сваю, дамы іхнія і намёты іхнія, і ўсе жывыя істоты, якія мелі спасярод усяго
Ізраіля ішлі за імі.
7 Вочы вашыя бачылі ўсе вялікія справы ГОСПАДА, якія Ён учыніў,
8 каб вы захоўвалі ўсе прыказаньні, якія сёньня я загадваю вам, каб вы ўмацаваліся і ўвайшлі,
і ўзялі на ўласнасьць зямлю, у якую ўваходзіце, каб авалодаць ёю,
9 і каб доўгія былі дні вашыя ў той зямлі, якую з прысягай абяцаў ГОСПАД бацькам вашым даць
ім і насеньню іхняму, зямлю, якая ацякае малаком і мёдам.
10 Бо зямля, у якую ты ўваходзіш, каб авалодаць ёю, ня ёсьць такою, як зямля Эгіпецкая, з якой
ты выйшаў, якую, укінуўшы зерне сваё, ты паліваў [працаю] ног тваіх, як у агародзе.
11 Зямля тая, у якую ты ўваходзіш, каб авалодаць ёю, — зямля гор і лагчынаў, якая п'е ваду з
неба.
12 Гэта зямля, якою ГОСПАД, Бог твой, апякуецца, і вочы ГОСПАДА, Бога твайго, заўсёды
зьвернуты на яе ад пачатку году аж да канца году.
13 “Дык калі ты будзеш слухаць прыказаньні Мае, якія сёньня Я загадваю вам, каб вы любілі
ГОСПАДА, Бога вашага, і служылі Яму ўсім сэрцам вашым і ўсёю душой вашай,
14 Я дам зямлі вашай у свой час дождж раньні і дождж позьні, і ты зьбярэш збожжа тваё, і віно
тваё, і алей твой.
15 І дам Я траву на палях тваіх для быдла твайго, і ты будзеш есьці і насыцішся”.
16 Сьцеражыцеся, каб не ашукалася сэрца вашае, каб не адыйшлі вы ад [Госпада], і не служылі
чужым багам, і не пакланяліся ім,
17 бо запалае ГОСПАД гневам на вас, і зачыніць неба, і ня будзе дажджу, і зямля ня дасьць плёну
свайго, і загінеце вы хутка на добрай зямлі, якую ГОСПАД дае вам.
18 І прыйміце гэтыя словы Мае ў сэрца вашае і ў душу вашую, і прывяжыце іх на знак на руку
вашую, і няхай будуць яны павязкаю над вачыма вашымі.
19 І навучыце ім сыноў вашых, прамаўляючы іх ім, калі ты сядзіш у доме тваім, калі ты ідзеш
дарогаю, калі ты кладзешся і калі ўстаеш.
20 І напішы іх на дзьвярах дому твайго і на брамах тваіх,
21 каб памножыліся дні твае і дні сыноў тваіх на зямлі, якую прысягнуў ГОСПАД бацькам тваім
даць ім, як дні неба над зямлёй.
22 Калі будзеце захоўваць усе прыказаньні гэтыя, якія я загадваю вам, і будзеце выконваць іх,
і будзеце любіць ГОСПАДА, Бога вашага, і будзеце хадзіць усімі шляхамі Ягонымі, і будзеце
туліцца да Яго,
23 ГОСПАД прагоніць перад вамі ўсе народы гэтыя, і вы авалодаеце народамі, якія большыя і
дужэйшыя за вас.
24 Кожнае месца, на якое стане нага вашая, будзе вашым. Ад пустыні і да Лібана, ад вялікай
ракі Эўфрат аж да Мора Заходняга будуць межы вашыя.
25 Ніхто не ўстаіць перад вамі, бо ГОСПАД, Бог ваш, навядзе страх і трывогу перад вамі на
аблічча ўсёй зямлі, на якую вы ступіце, як Ён прамовіў да вас.
26 Глядзі, Я даю вам сёньня дабраславенства і праклён;

27 дабраславенства, калі будзеце слухаць прыказаньні ГОСПАДА, Бога вашага, якія я загадваю
вам сёньня,
28 і праклён, калі ня будзеце слухаць прыказаньняў ГОСПАДА, Бога вашага, і зыйдзеце са
шляху, які я загадваю вам сёньня, і пойдзеце за багамі чужымі, якіх ня ведаеце.
29 І станецца, калі ўвядзе цябе ГОСПАД, Бог твой, у зямлю, якую ты ідзеш атрымаць на
ўласнасьць, ты абвясьці дабраславенства на гары Гарызім, а праклён — на гары Эваль.
30 Горы гэтыя за Ярданам, на шляху на захад сонца, у зямлі Хананейцаў, якія жывуць у Арабе
насупраць Гільгалу, каля дубоў Марэ.
31 Бо вы пяройдзеце праз Ярдан, каб прыйсьці і заваладаць зямлёю, якую ГОСПАД, Бог ваш, дае
вам, і возьмеце яе на ўласнасьць, і будзеце жыць на ёй.
32 Дык захоўвайце і выконвайце ўсе пастановы і прысуды, якія я даю вам сёньня.

Друг 12

1 Гэта пастановы і прысуды, якія вы будзеце захоўваць і выконваць у зямлі, якую ГОСПАД, Бог
бацькоў вашых, даў вам, каб валодалі ёю ў-ва ўсе дні жыцьця вашага на зямлі.
2 Зьнішчэньнем зьнішчыце ўсе месцы, дзе народы, якімі вы авалодаеце, служылі багам сваім
на гарах высокіх, на ўзгорках і пад кожным дрэвам зялёным.
3 Зруйнуйце ахвярнікі іхнія, скрышыце слупы іхнія, агнём спаліце астартаў іхніх, і паразь-
бівайце выявы багоў іхніх, і сатрыце імёны іхнія з месца гэтага.
4 Не рабіце так ГОСПАДУ, Богу вашаму,
5 але месца, якое выбраў ГОСПАД, Бог ваш, з усіх каленаў вашых, каб там памясьціць імя Сваё
і ў ім жыць, будзеце шукаць, і туды прыходзіць,
6 і туды будзеце прыносіць цэласпаленьні вашыя, ахвяры крывавыя вашыя, дзесяціны вашыя і
дары рук вашых, і шлюбаваньні вашыя, і дабраахвотныя ахвяры вашыя, і першародных валоў
вашых і авечак вашых.
7 Там, перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага, будзеце есьці вы і дамы вашыя і будзеце
радавацца з усяго, што зрабілі рукі вашыя, у чым дабраславіў вас ГОСПАД, Бог ваш.
8 Ня будзеце там рабіць таго, што мы тут робім сёньня, калі кожны [робіць] усё, што слушнае
ў вачах ягоных,
9 бо вы яшчэ не прыйшлі ў месца супачынку і да ўласнасьці, якую дае вам ГОСПАД, Бог ваш.
10 І вы пяройдзеце Ярдан, і абжывіцёся ў зямлі, якую дае вам ГОСПАД, Бог ваш, каб жылі ў
супакоі ад усіх ворагаў навокал і жылі ў бясьпецы.
11 І будзе месца, якое выбраў ГОСПАД, Бог ваш, каб у ім жыло імя Ягонае. Туды прыносьце ўсё,
што я загадваю вам: цэласпаленьні вашыя, ахвяры крывавыя вашыя, дзесяціны вашыя, дары
рук вашых і ўсе шлюбаваньні вашыя, якія вы абяцалі для ГОСПАДА.
12 І будзеце радавацца перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага, вы, і сыны вашыя, і дочкі вашыя,
слугі вашыя і служкі вашыя, і лявіт, які ў брамах вашых, бо ня мае ён ані часткі, ані спадчыны
паміж вамі.
13 Сьцеражыцеся, каб не складаць цэласпаленьняў тваіх на кожным месцы, якое ўбачыш.
14 Але на тое месца, якое выбраў ГОСПАД у адным з каленаў тваіх, занясеш усе ахвяры твае і
зробіш усё, што я загадваю табе.
15 Але колькі зажадае душа твая будзеш забіваць [жывёлу] і есьці мяса паводле
дабраславенства ГОСПАДА, Бога твайго, якое Ён дасьць табе ў-ва ўсіх брамах тваіх; чысты і
нячысты можа есьці яго, як сарну і аленя.
16 Толькі крыві ня будзеш есьці; выльеш яе на зямлю, як ваду.
17 Ня будзеш есьці ў брамах тваіх дзесяціны збожжа твайго, віна твайго і алею твайго,
першародных валоў тваіх і авечак тваіх, усяго шлюбаваньня твайго, якое ты абяцаў ГОСПАДУ,
Богу твайму, ахвяраў дабраахвотных і дароў з рукі тваёй.
18 Але толькі перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, у месцы, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой,
будзеш есьці іх ты і сын твой, і дачка твая, і слуга твой, і служка твая, і лявіт, які ў брамах тваіх;
і будзеш радавацца перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, з усяго, што здабыла рука твая.

19 Сьцеражыся, каб не пакінуў ты лявіта ў-ва ўсе дні твае на зямлі тваёй.
20 Калі пашырыць ГОСПАД, Бог твой, межы твае, як Ён сказаў табе, і ты скажаш: "Хачу есьці
мяса", калі зажадае душа твая есьці мяса, паводле прагненьня душы тваёй еш мяса.
21 Калі месца, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб там зьмясьціць імя Сваё, будзе далёка ад
цябе, тады забі вала твайго і авечку тваю, якіх даў табе ГОСПАД, як я загадаў табе, і еш у брамах
тваіх паводле прагненьня душы тваёй.
22 Як ясьцё сарну і аленя, так іх еш; чысты, і нячысты нароўні могуць гэта есьці.
23 Толькі будзь моцны, каб ня еў ты крыві; бо кроў ёсьць душа, і ты ня будзеш есьці душу разам
з мясам.
24 Ня будзеш есьці яе, але вылі яе на зямлю, як ваду.
25 Ня будзеш есьці яе, каб было добра табе і сынам тваім пасьля цябе, калі будзеш рабіць тое,
што слушна ў вачах ГОСПАДА.
26 Але тое, што пасьвяціў ты і шлюбаваў ГОСПАДУ, вазьмі і занясі на тое месца, якое выбраў
ГОСПАД.
27 І ахвяруеш цэласпаленьні твае, мяса і кроў, на ахвярніку ГОСПАДА, Бога твайго; і кроў
ахвяраў тваіх выльеш на ахвярніку ГОСПАДА, Бога твайго, а мяса зьясі.
28 Захоўвай і слухай усе словы гэтыя, якія я загадваю табе, каб было добра табе і сынам тваім
пасьля цябе на вякі, калі будзеш рабіць тое, што добрае і што слушнае ў вачах ГОСПАДА, Бога
твайго.
29 Калі ГОСПАД, Бог твой, выганіць перад табою народы, да якіх ты ідзеш, каб завалодаць імі, і
ты завалодаеш імі, і абжывешся на зямлі іхняй,
30 сьцеражыся, каб не патрапіць у пастку з імі, калі яны будуць выгубленыя перад табою, і не
шукаць багоў іхніх, кажучы: “Як служылі народы гэтыя багам сваім, так і я буду служыць ім”.
31 Не рабі гэтак ГОСПАДУ, Богу твайму, бо ўсё, чым брыдзіцца ГОСПАД і што ненавідзіць, яны
багам сваім рабілі, нават сыноў сваіх і дачок сваіх у агні палілі для багоў сваіх.
32 Усе словы, якія я загадваю вам, захоўвайце і выконвайце. Не дадавайце да іх і не адымайце
ад іх.

Друг 13

1 Калі паўстане сярод цябе прарок або той, які сьніць сны, і пакажа табе знак або цуд.
2 і споўніцца той знак або цуд, які ён прадказаў, і скажа [той прарок]: “Пойдзем за іншымі
багамі, якіх ты ня ведаеш, і будзем ім служыць”,
3 ня слухай словаў такога прарока або таго, які сьніць сны, бо выспрабоўвае вас ГОСПАД, Бог
ваш, каб даведацца, ці ты любіш ГОСПАДА, Бога твайго, усім сэрцам тваім і ўсёй душой тваёй.
4 За ГОСПАДАМ, Богам вашым, ідзіце і Яго бойцеся, і прыказаньні Ягоныя выконвайце, і
слухайцеся голасу Ягонага, Яму служыце і да Яго туліцеся.
5 А прарок той або той, які сьніць сны, няхай будзе забіты, бо гаварыў, каб адвярнуць вас ад
ГОСПАДА, Бога вашага, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай і вызваліў цябе з дому няволі, каб
зьвесьці цябе з таго шляху, які табе загадаў ГОСПАД, Бог твой, каб ісьці па ім. І выкараніш
зло з асяродзьдзя твайго.
6 Калі будзе намаўляць цябе брат твой, сын маці тваёй, або сын твой, або дачка твая, або
жонка ўлоньня твайго, або сябра твой, якога [любіш], як душу сваю, таемна кажучы: “Хадзем
і будзем служыць багам чужым”, якіх ані ты ня ведаеш, ані бацькі твае,
7 багам тых народаў, якія вакол цябе, блізкіх да цябе ці далёкіх ад цябе ад аднаго канца зямлі
да другога канца зямлі,
8 ня слухай яго і не згаджайся з ім, і няхай ня літуецца вока тваё над ім, ня мей шкадаваньня,
і не хавай [злачынства] ягонага,
9 але, забіваючы, забі яго. Рука твая няхай будзе першай, каб забіць яго, а рука ўсяго народу —
пасьля [цябе].
10 Укамянуй яго камянямі, і ён памрэ, бо ён хацеў адцягнуць цябе ад ГОСПАДА, Бога твайго,
Які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай, з дому няволі.
11 І ўвесь Ізраіль пачуе гэта, і будзе баяцца, і кіне рабіць гэткія рэчы, ліхоту ў асяродзьдзі тваім.

12 Калі пачуеш у адным з гарадоў тваіх, якія ГОСПАД, Бог твой, дае табе на пражываньне, як
нехта кажа:
13 “Выйшлі з асяродзьдзя твайго людзі, сыны Бэліяла, і яны зводзяць жыхароў гораду свайго,
кажучы: "Хадзем і будзем служыць багам чужым, якіх ня ведаеце"”, —
14 тады распытай, і дасьледуй, і добра правер. І вось, праўду гаворыць слова гэтае і такую
брыдоту робяць у асяродзьдзі тваім.
15 Тады, забіваючы, забі вострывам мяча жыхароў гораду гэтага і аддай закляцьцю яго і ўсё,
што ў ім; і жывёлу ягоную [заб'еш] вострывам мяча.
16 А ўсю здабычу з яго зьбяры на сярэдзіну плошчы і спалі агнём горад і ўсю здабычы дашчэнту
для ГОСПАДА, Бога твайго, і будзе ён у руінах на вякі, і не адбудуецца болей.
17 І няхай не прыліпне да рукі тваёй нічога з заклятага, каб ГОСПАД адвярнуў ярасьць гневу
Свайго, і зьявіў табе літасьць, і зьлітаваўся над табой, і памножыў цябе, як Ён прысягнуў
бацькам тваім,
18 калі будзеш слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, захоўваючы ўсе прыказаньні Ягоныя, якія
я загадваю табе сёньня, і робячы тое, што слушна ў вачах ГОСПАДА, Бога твайго.

Друг 14

1 Вы — сыны ГОСПАДА, Бога вашага; ня будзеце рабіць нарэзы на скуры, і ня будзеце
выстрыгаць валасоў над вачыма вашымі па памёршых,
2 бо ты — народ сьвяты для ГОСПАДА, Бога твайго, бо цябе выбраў ГОСПАД, каб ты стаўся
выбраным народам Ягоным спасярод усіх народаў, якія на абліччы зямлі.
3 Ня будзеш есьці нічога паганага.
4 Вось зьвяры, якіх вы будзеце есьці: вол, ягня авечак і козаў,
5 алень, сарна, казуля, ланя, зубар, антылёпа, горны казёл.
6 І кожную жывёлу, якая мае разьдзеленыя капыты і на абодвух капытах глыбокі разрэз, і тую
жывёлу, якая жуе жвайку, будзеце есьці.
7 Але ня будзеце есьці тых, якія жуюць жвайку і ня маюць разьдзеленыя капыты з глыбокім
разрэзам: вярблюда, зайца і дамана, бо яны жуюць жвайку, але капыты ў іх не разьдзелены,
яны для вас нячыстыя.
8 І сьвіньня, хоць капыты ў яе разьдзеленыя, але яна не жуе жвайку, будзе для вас нячыстай;
мяса яе ня ешце і падліны не дакранайцеся.
9 З усяго, што ў вадзе, будзеце есьці ўсіх, якія маюць плаўнікі і луску.
10 А ўсё, што без плаўніка і лускі, ня будзеце есьці, бо яны для вас нячыстыя.
11 Усіх птушак чыстых будзеце есьці.
12 Спасярод [птушак] ня будзеце есьці: арла, грыфа і марскога арла,
13 каршука, сокала і каню паводле гатункаў іхніх,
14 і ўсякага крумкача паводле гатунку яго,
15 страуса, савы, чайкі і ястраба паводле гатункаў яго,
16 пугача, ібіса і лебедзя,
17 пэлікана, сыча і рыбалова,
18 чаплі, буслоў паводле гатункаў іхніх, удода і кажана.
19 Кожная жужла крылатая для вас нячыстая, ня будзеце яе есьці.
20 Усіх птушак чыстых будзеце есьці.
21 Ня будзеце есьці ніякай падліны. Дасі яе прыхадню, які ў брамах тваіх, і будзе есьці, або
прадасі чужынцу, бо ты — народ сьвяты для ГОСПАДА, Бога твайго. Не вары казьляняці ў
малацэ маці ягонай.
22 Давай дзесяціну з усіх пладоў насеньня твайго, з таго, што поле штогод родзіць.
23 І еш перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, на тым месцы, якое Ён выбраў, каб было там
імя Ягонае, дзесяціну збожжа твайго, і віна твайго, і алею твайго, і першародных валоў тваіх і
авечак тваіх, каб вучыўся ты баяцца ГОСПАДА, Бога твайго, у-ва ўсе дні.

24 Калі ж далёкай будзе дарога [твая] і ня зможаш гэта прынесьці, бо далёка ад цябе месца,
якое выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб там было імя Ягонае, і калі ГОСПАД, Бог твой, дабраславіў
цябе,
25 тады памяняй гэта на срэбра, і вазьмі срэбра ў руку тваю, і ідзі на месца, якое выбраў
ГОСПАД, Бог твой,
26 і купляй там за гэта срэбра ўсё, чаго жадае душа твая, ці валоў, ці авечак, ці віно, ці сікеру, ці
ўсё, чаго жадае душа твая; і будзеш есьці там перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, і будзеш
весяліцца ты і дом твой.
27 І не пакідай лявіта, які ў брамах тваіх, бо ён ня мае ані часткі, ані спадчыны з табою.
28 Пад канец трэцяга году адлажы ўсе дзесяціны з пладоў тваіх году гэтага і пакінь у брамах
тваіх.
29 І прыйдзе лявіт, бо ён ня мае ані часткі, ані спадчыны з табой, і прыхадзень, і сірата, і ўдава,
якія ў брамах тваіх, і будуць яны есьці, і насыцяцца, каб дабраславіў цябе ГОСПАД, Бог твой, у
кожнай працы рук тваіх, якую будзеш рабіць.

Друг 15

1 У канцы сёмага году даруй даўгі.
2 Дараваньне даўгоў [палягае] на тым, што кожны пазыкадавец, які пазычыў бліжняму свайму
з рукі сваёй, ня будзе вымагаць звароту пазыкі ад бліжняга або брата свайго, бо абвешчана
дараваньне даўгоў [на ўшанаваньне] ГОСПАДА.
3 Ад чужога будзеш вымагаць [звароту доўга], але што будзе тваё ў брата твайго, няхай даруе
рука твая.
4 Не павінна быць у цябе ўбогага, бо ГОСПАД, дабраслаўляючы, дабраславіць цябе ў зямлі, якую
ГОСПАД, Бог твой дае табе як спадчыну на ўласнасьць,
5 калі толькі будзеш слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўваць, і выконваць усе
прыказаньні гэтыя, якія сёньня я загадваю табе.
6 Бо ГОСПАД, Бог твой, будзе дабраслаўляць цябе, як абяцаў табе. І ты будзеш пазычаць
шматлікім народам, а сам ня будзеш браць пазыкі; будзеш панаваць над шматлікімі народамі,
а над табою [ніхто] ня будзе панаваць.
7 Калі адзін з братоў тваіх, які ў адной з брамаў тваіх у зямлі тваёй, якую дае табе ГОСПАД,
Бог твой, будзе ўбогім, не зацьвярдзі сэрца твайго і ня сьцісьні рукі тваёй перад убогім братам
тваім,
8 але, адкрываючы, адкрый яму руку тваю і шчодра дай яму пазыку паводле патрэбы ягонай,
што будзе патрэбна яму.
9 Сьцеражыся, каб не было ў сэрцы тваім слова нягоднага, кажучы: “Блізка сёмы год, год
дараваньня даўгоў”, і ліхім вокам ты паглядзіш на ўбогага брата твайго, і не дасі яму
[дапамогі], і ён будзе клікаць ГОСПАДА супраць цябе, і ты абцяжарышся грэхам.
10 Даючы, дай яму, і няхай не сумуе сэрца тваё, што даеш, бо за гэта будзе дабраслаўляць цябе
ГОСПАД, Бог твой, у кожнай справе і ў кожнай працы, і ў кожным дзеяньні рук тваіх.
11 Бо будуць убогія ў зямлі гэтай. Дзеля гэтага я загадваю табе, кажучы: “Адкрываючы,
адкрывай руку тваю брату твайму, які ў патрэбе, і ўбогаму, які ў зямлі тваёй”.
12 Калі прадасца табе брат твой, Гебрай або Гебрайка, няхай будзе нявольнікам шэсьць гадоў.
У сёмы год выпусьціш яго вольным ад сябе.
13 Калі будзеш, вызваляючы, вызваляць яго, не адпусьціш яго з пустымі [рукамі].
14 Адорваючы, адаруеш яго і дасі яму з авечак тваіх, з току твайго і з тоўчні тваёй, якімі
дабраславіў цябе ГОСПАД, Бог твой.
15 Памятай, што ты быў нявольнікам у зямлі Эгіпецкай, і вызваліў цябе ГОСПАД, Бог твой.
Дзеля гэтага я загадваю табе гэта слова сёньня.
16 А станецца, што ён скажа табе: “Не адыйду ад цябе, бо люблю цябе і дом твой”, бо добра яму
ў цябе.

17 Тады возьмеш шыла і праколеш вуха яму пры дзьвярах, і будзе ён табе служыць вечна, і
падобна зробіш і з нявольніцай тваёй.
18 Няхай ня будзе прыкрым у вачах тваіх, што пускаеш яго свабодна ад цябе, бо служачы
табе шэсьць гадоў, ён зарабіў табе падвойную плату найміта, а ГОСПАД, Бог твой, будзе
дабраслаўляць цябе ў-ва ўсім, што робіш.
19 Усіх першародных мужчынскага роду, якія родзяцца ў валоў тваіх і авечак тваіх, маеш
пасьвяціць ГОСПАДУ, Богу твайму. Ня будзеш працаваць першародным валом тваім і ня
будзеш стрыгчы першароднага з авечак тваіх.
20 Штогод перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, у месцы, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой,
будзеш есьці іх ты і дом твой.
21 Калі яно будзе мець загану, будзе сьляпое, кульгавае або з нейкім недахопам, ня зложыш
такога ў ахвяру ГОСПАДУ, Богу твайму.
22 У брамах тваіх зьясі яго. Чысты і нячысты [чалавек] можа есьці яго, як сарну і аленя.
23 Толькі крыві іхняй ня будзеш есьці; выльлеш яе на зямлю, як ваду.

Друг 16

1 Захоўвай месяц Авіў і сьвяткаваньне Пасхі ГОСПАДА, Бога твайго, бо ў месяцы Авіў вывеў
цябе ГОСПАД, Бог твой, з Эгіпту ноччу.
2 І ахвяруеш ахвяру Пасхі ГОСПАДУ, Богу твайму, авечку ці цяля, у месцы, якое выбраў ГОСПАД,
Бог твой, каб было там імя Ягонае.
3 Ня будзеш есьці з ёю кіслае. Сем дзён будзеш есьці з ёю праснакі, хлеб бедаваньня, бо
пасьпешліва выйшаў ты з зямлі Эгіпецкай, каб ты памятаў пра дзень выхаду твайго з зямлі
Эгіпецкай усе дні жыцьця свайго.
4 Ня будзе бачна ў цябе кісьлі ў-ва ўсіх межах тваіх сем дзён. З мяса, якое будзе складзена ў
ахвяру вечарам, у першы дзень, нічога няхай не застанецца праз ноч да раніцы.
5 Ня можаш складаць ахвяру Пасхі ў нейкай з брамаў тваіх, якія дае табе ГОСПАД, Бог твой,
6 але толькі ў тым месцы, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб было там імя Ягонае, складзеш
ахвяру Пасхі ўвечары пры захадзе сонца ў той самы час, калі выйшаў ты з Эгіпту.
7 І сьпячэш, і і будзеш есьці ў тым месцы, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой; а раніцаю ўстанеш і
вернешся ў намёты свае.
8 Шэсьць дзён будзеш есьці праснакі, а на сёмы дзень будзе ўрачысты сход на [ўшанаваньне]
ГОСПАДА, Бога твайго, ня будзеш рабіць [аніякай] працы.
9 Адлічыш сабе сем тыдняў ад таго [дня], калі серп пачне [жаць] збожжа,
10 і будзеш сьвяткаваць сьвята Тыдняў на ўшанаваньне ГОСПАДА, Бога твайго, са шчодрымі
дабраахвотнымі ахвярамі, якія ты дасі паводле таго, як дабраславіў цябе ГОСПАД, Бог твой.
11 І будзеш весяліцца перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, і ты, і сын твой, і дачка твая, і
слуга твой, і служка твая, і лявіт, які ў брамах тваіх, і прыхадзень, і сірата, і ўдава, якія з табою
ў месцы, якое выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб там было імя Ягонае.
12 І памятай, што ты быў нявольнікам у Эгіпце, і будзеш захоўваць і выконваць пастановы
гэтыя.
13 Будзеш сьвяткаваць сьвята Намётаў сем дзён пасьля збору пладоў з току твайго і тоўчні
тваёй.
14 І будзеш весяліцца ў сьвята тваё ты, і сын твой, і дачка твая, і слуга твой, і служка твая, і
лявіт, і прыхадзень, і сірата, і ўдава, якія ў брамах тваіх.
15 Сем дзён будзеш сьвяткаваць [сьвяты] ГОСПАДУ, Богу твайму, у месцы, якое выбраў
ГОСПАД; бо будзе дабраслаўляць цябе ГОСПАД, Бог твой, у-ва ўсіх пладах тваіх і ў-ва ўсякай
працы рук тваіх, і будзеш поўны радасьці.
16 Тры разы ў год няхай зьявіцца кожны мужчына твой перад аблічча ГОСПАДА, Бога твайго,
у месцы, якое Ён выбраў: на сьвята Праснакоў, на сьвята Тыдняў і на сьвята Намётаў. І [ніхто]
няхай не прыходзіць перад аблічча ГОСПАДА з пустымі [рукамі].

17 Кожны няхай [прынясе] дар рукі сваёй паводле дабраславенства ГОСПАДА, Бога твайго, якое
Ён дасьць табе.
18 Паставіш судзьдзяў і загадчыкаў працы ў-ва ўсіх брамах тваіх, якія дае табе ГОСПАД, Бог
твой, для ўсіх каленаў тваіх, і будуць судзіць народ судом праведным.
19 Не крыві суду. Не глядзі на аблічча і не бяры падарункі, бо падарунак засьляпляе вочы
мудрым і перакручвае словы праведных.
20 Да праведнасьці, да праведнасьці імкніся, каб ты жыў і ўспадкаеміў зямлю, якую дае табе
ГОСПАД, Бог твой.
21 Не садзі сабе гаёў з дрэваў каля ахвярніка ГОСПАДА, Бога твайго, які збудуеш сабе.
22 Ня стаў сабе слупы, якія ненавідзіць ГОСПАД, Бог твой.

Друг 17

1 Не складай у ахвяру ГОСПАДУ, Богу твайму, авечку і вала, якія маюць загану або нейкі
недахоп, бо брыдзіцца гэтым ГОСПАД, Бог твой.
2 Калі знойдзецца ў асяродзьдзі тваім, у адной з брамаў тваіх, якія дае табе ГОСПАД, Бог твой,
мужчына або жанчына, якія зробяць тое, што ліхім будзе ў вачах ГОСПАДА, Бога твайго, і
парушаць запавет Ягоны,
3 і пойдуць, і будуць служыць багам чужым, і будуць пакланяцца ім, ці сонцу, ці месяцу, ці
ўсяму войску нябеснаму, што я забараніў табе,
4 і пра гэта паведамяць табе, ты выслухаеш і старанна дасьледуеш, і вось, гэта праўда, што
такой брыдоты дапусьціліся ў Ізраілі.
5 Тады завядзеш таго мужчыну або жанчыну, якія дапусьціліся такой ліхой рэчы, да брамаў
тваіх і ўкамянуеш іх камянямі, і яны памруць.
6 Паводле [словаў] з вуснаў двух або трох сьведкаў [вінаваты] сьмерцю памрэ; не памрэ
паводле [словаў] з вуснаў аднаго сьведкі.
7 Рука сьведкаў будзе першай супраць яго, каб забіць [вінаватага], а потым рука ўсяго народу,
і вынішчыш зло з асяродзьдзя твайго.
8 Калі цяжкая будзе для цябе справа суду паміж крывёй і крывёй, паміж спрэчкай і спрэчкай,
паміж бойкай і бойкай, і будуць нязгодныя словы ў брамах тваіх, устань і пайдзі на месца,
якое выбраў ГОСПАД, Бог твой,
9 і прыйдзі да сьвятароў лявітаў і да судзьдзі, які будзе ў гэтыя дні, і спытайся ў іх, і яны
паведамяць табе, слова прысуду.
10 І зрабі паводле слова, якое яны скажуць табе ў месцы, якое выбраў ГОСПАД, і намагайся, каб
выканаць усё так, як яны навучаць цябе.
11 Паводле [слова] з вуснаў закону, якім яны навучаць, і паводле прысуду, які табе скажуць,
зробіш. Не адхіляйся ад слова, якое паведамілі табе ані ўправа, ані ўлева.
12 А [чалавек], які з пыхлівасьці не паслухае сьвятара, які стаіць, каб спаўняць служэньне для
ГОСПАДА, Бога твайго, або судзьдзі, памрэ той чалавек, і вынішчыш зло з Ізраіля.
13 І ўвесь народ, чуючы [гэта], будзе баяцца і ўжо болей ня будзе пыхлівы.
14 Калі ты прыйдзеш у зямлю, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, і завалодаеш ёю, і абжывешся
на ёй, і скажаш: “Пастаўлю я над сабою валадара, як усе народы, якія вакол мяне”,
15 пастаўляючы, паставіш над сабой валадара, якога ГОСПАД, Бог твой, выбярэ спасярод братоў
тваіх. Ня можаш паставіць над сабой чужынца, які ня брат твой.
16 Толькі няхай не памнажае ён сабе коней і не вяртае народ у Эгіпет, каб мець шмат коней,
бо ГОСПАД сказаў вам: “Ніколі больш гэтаю дарогаю ня вернецеся”.
17 І няхай ён не памнажае жонак сваіх, каб не адвярнулася сэрца ягонае, і няхай не памнажае
срэбра і золата.
18 Калі сядзе ён на пасадзе валадарства свайго, няхай перапіша сабе на скрутку сьпіс Закону
гэтага з [кнігі], якая ў сьвятароў лявітаў,
19 і мае яго пры сабе, і чытае яго ўсе дні жыцьця свайго, каб навучыўся баяцца ГОСПАДА, Бога
свайго, і захоўваць усе словы Закону гэтага, і пастановы гэтыя выконваць,

20 каб не вывышалася сэрца ягонае па-над братамі ягонымі, і каб не адхіляўся ён ад
прыказаньняў ані ўправа, ані ўлева, каб доўгімі былі дні валадарства ягонага і сыноў ягоных
у Ізраілі.

Друг 18

1 Сьвятары лявіты, усё калена Левія, ня будуць мець ані часткі, ані спадчыны ў Ізраілі. Будуць
жывіцца з ахвяраў агнявых для ГОСПАДА і са спадчыны Ягонай.
2 Не атрымаюць яны спадчыны сярод братоў сваіх, бо ГОСПАД — спадчына іхняя, як Ён
прамовіў да іх.
3 І гэта будзе належаць сьвятару ад народу, які складае ахвяры. Калі [складаюць у ахвяру] вала
або авечку, даюць сьвятару лапатку, сківіцу і страўнік.
4 Аддасі яму пяршыны збожжа твайго, віна твайго, алівак тваіх і пяршыны [воўны] ад стрыжкі
авечак тваіх.
5 Бо яго выбраў ГОСПАД, Бог твой, з усіх каленаў тваіх, каб ён стаяў на служэньні ў імя
ГОСПАДА, Бога твайго, ён і сыны ягоныя ў-ва ўсе дні.
6 Калі лявіт, які жыве ў адной з брамаў тваіх з усяго Ізраіля, як прыхадзень пойдзе і прыйдзе
паводле жаданьня душы сваёй у месца, якое выбраў ГОСПАД,
7 і будзе служыць у імя ГОСПАДА, Бога свайго, як усе браты ягоныя лявіты, якія там на службе
перад абліччам ГОСПАДА,
8 няхай [атрымлівае] для спажываньня частку, роўную з іншымі, акрамя [прыбытку] з
продажу бацькоўскага [дому] свайго.
9 Калі ты ўвойдзеш у зямлю, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, не вучыся рабіць брыдоты
народаў гэтых.
10 Няхай ня знойдзецца ў цябе той, хто сына свайго або дачку праводзіць праз агонь, ці глядзіць
на аблокі, ці займаецца варажбой ці чараваньнем,
11 ці займаецца заклёнамі, пытаецца ў духаў [памёршых] або выклікае памёршых.
12 Бо агідны для ГОСПАДА кожны, хто гэтак робіць. Дзеля гэтых брыдотаў выганяе іх ГОСПАД
ад аблічча твайго.
13 Беззаганным будзь перад ГОСПАДАМ, Богам тваім.
14 Бо тыя народы, у зямлю якіх ты ўваходзіш, слухаюць тых, хто глядзіць на аблокі ці
займаецца варажбой; гэтага не дазваляе табе ГОСПАД, Бог твой.
15 Прарока як мяне ўзьніме табе з братоў тваіх ГОСПАД, Бог твой; Яго слухайце.
16 Паводле ўсяго, што прасіў ты ў ГОСПАДА, Бога твайго, на Харэве, у дзень супольнага сходу,
калі ты казаў: “Не магу болей слухаць голас ГОСПАДА, Бога майго, і глядзець болей на агонь
гэты вялікі, каб не памерці”.
17 І сказаў мне ГОСПАД: “Слушна тое, што яны сказалі.
18 Я пастаўлю ім спаміж братоў іхніх Прарока, [падобнага] табе, і ўкладу словы Мае ў вусны
Ягоныя, і Ён прамовіць да іх усё, што Я загадаю Яму.
19 І станецца, што кожнага, які ня будзе слухаць словаў Маіх, якія будзе прамаўляць Прарок
той у імя Маё, Я пакараю.
20 А прарок, які адважыцца гаварыць у імя Маё таго, чаго Я не загадаў яму, каб ён казаў, або
які будзе прамаўляць у імя чужых багоў, такі прарок павінен памерці”.
21 А калі ты скажаш у сэрцы тваім: “Як я магу даведацца, што словы гэтыя ГОСПАД не
прамаўляў?”,
22 калі прарок прадказаў у імя ГОСПАДА, а ня сталася так, і ня споўнілася, гэта ня тое слова,
якое прамовіў ГОСПАД, але ў пыхлівасьці сваёй гэта прамовіў прарок. Ня бойся яго.

Друг 19

1 Калі ГОСПАД, Бог твой, зьнішчыць народы, зямлю якіх ГОСПАД, Бог твой, дае табе, каб ты
завалодаў ёю і пасяліўся ў гарадах іхніх і дамах іхніх,
2 тады выдзелі сабе тры гарады з усёй зямлі, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, на ўласнасьць,

3 і падрыхтуй шлях, і падзялі на тры [часткі] абшар зямлі тваёй, якую дае табе ў спадчыну
ГОСПАД, Бог твой, і кожны забойца знойдзе там прыбежышча.
4 А гэта слова адносна забойцы, які ўцячэ туды і будзе жыць. Калі ён забіў бліжняга свайго
ненаўмысна і ня меў нянавісьці да яго ані ўчора, ані пазаўчора,
5 калі пайшоў нехта з бліжнім сваім у лес секчы дрэвы і размахнулася рука ягоная з сякерай,
каб сьсекчы дрэва, і саскочыла жалеза з тапарышча і ўдарыла бліжняга ягонага, і той памёр,
такі можа схавацца ў адным з гарадоў гэтых, і будзе жыць,
6 каб мсьціўца за кроў у гарачнасьці сэрца свайго не пагнаўся за забойцам і не дагнаў яго, калі
дарога далёкая, і не забраў душу ягоную, бо ён ня мае прысуду на сьмерць, бо ня меў нянавісьці
[да забітага] ані ўчора, ані пазаўчора.
7 Дзеля гэтага я загадваю табе, кажучы: "Выдзелі сабе тры гарады.
8 Калі ГОСПАД, Бог твой, пашырыць межы твае, як Ён запрысяг бацькам тваім, і аддасьць табе
ўсю зямлю, якую абяцаў даць бацькам тваім,
9 калі ты будзеш захоўваць і выконваць прыказаньне гэтае, якое я табе сёньня загадваю, каб ты
любіў ГОСПАДА, Бога твайго, і хадзіў шляхамі Ягонымі ўсе дні, тады дадасі да гэтых гарадоў
яшчэ тры гарады,
10 каб не праліваць нявіннай крыві ў зямлі тваёй, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, на
ўласнасьць, і ня будзе на табе крыві.
11 Калі чалавек меў нянавісьць да бліжняга свайго, і цікаваў на яго, і паўстаў супраць яго, і
забраў душу ягоную, і той памёр, і ўцячэ ў адзін з гарадоў гэтых,
12 тады старшыні гораду ягонага пашлюць па яго, забяруць яго адтуль і аддадуць у рукі
мсьціўца за кроў, і ён памрэ.
13 Няхай не пашкадуе яго вока тваё, і ты змыеш кроў нявінную з Ізраіля, і будзе добра табе.
14 Не перасоўвай мяжы бліжняга твайго, якую вызначылі продкі ў спадчыне тваёй, якую ты
атрымаў у зямлі, якую дае табе на ўласнасьць ГОСПАД, Бог твой.
15 Не паўстане адзін сьведка супраць чалавека, [абвінавачваючы] ў нейкім беззаконьні ці ў
некім грэху. У кожным граху, якім саграшыў чалавек, паводле [словаў] з вуснаў двух або трох
сьведкаў выносіцца рашэньне.
16 Калі паўстане сьведка фальшывы супраць чалавека, вінавацячы яго ў злачынстве,
17 няхай стануць абодва чалавекі, што маюць спрэчку, перад абліччам ГОСПАДА, перад
сьвятарамі і судзьдзямі, якія будуць у тыя дні.
18 І судзьдзі старанна дасьледуюць, і вось, сьведка той — сьведка фальшывы, ён фальшыва
гаварыў на брата свайго,
19 тады зрабіце яму тое, што ён меў намер зрабіць брату свайму, і вынішчыш зло з асяродзьдзя
твайго.
20 А іншыя пачуюць [пра гэта] і будуць баяцца, і ніколі больш у асяродзьдзі тваім такіх рэчаў
ня будуць рабіць.
21 Няхай не шкадуе яго вока тваё, але душу за душу, вока за вока, зуб за зуб, руку за руку, нагу
за нагу [запатрабуеш].

Друг 20

1 Калі выйдзеш на вайну супраць ворагаў тваіх і ўбачыш, што [ў іх] і коней, і калясьніцаў, і
людзей болей, чым у цябе, ня бойся іх, бо з табой ГОСПАД, Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі
Эгіпецкай.
2 Перад пачаткам бою няхай выйдзе сьвятар, і прамовіць да народу, і скажа яму:
3 “Слухай, Ізраіль! Вы выходзіце сёньня на бой супраць ворагаў вашых. Няхай не палохаецца
сэрца вашае, ня бойцеся, і не трывожцеся, і не пужайцеся аблічча іхняга,
4 бо ГОСПАД, Бог ваш, ідзе з вамі, каб ваяваць за вас з ворагамі вашымі і каб выратаваць вас”.
5 І прамовяць начальнікі да народу, кажучы: “Хто пабудаваў новы дом, і яго не асьвяціў, няхай
ідзе і вяртаецца ў дом свой, каб не загінуў на вайне, і нехта іншы яго асьвяціць.

6 Хто пасадзіў вінаграднік і не асьвяціў яго, няхай ідзе і вяртаецца ў дом свой, каб не загінуў
на вайне, і нехта іншы асьвяціць яго.
7 Хто заручыўся з жонкаю, але ня ўзяў яе за жонку, няхай ідзе і вяртаецца ў дом свой, каб не
загінуў на вайне, і нехта іншы возьме яе”.
8 І яшчэ няхай начальнікі прамовяць да народу і скажуць: “Хто баіцца і чыё сэрца дрыжыць,
няхай ідзе і вернецца ў дом свой, каб не зрабіў дрыготкім сэрцы братоў сваіх, як [дрыготкае]
сэрца ягонае”.
9 Калі начальнікі скончаць прамаўляць да народу, вы паставіце ваенных начальнікаў на чале
народу.
10 Калі ты падыйдзеш да гораду, каб супраць яго ваяваць, [перш] прапануй яму мір.
11 Калі ён згодзіцца на мір і адчыніць табе [брамы], няхай увесь народ, які ў ім, будзе плаціць
табе даніну і служыць табе.
12 А калі ён не захоча быць у міры з табою і пачне супраць цябе вайну, ты пачні аблогу яго.
13 І калі ГОСПАД, Бог твой, аддасьць яго ў рукі твае, выб’еш усіх мужчынаў ягоных вострывам
мяча.
14 Толькі жанчынаў і дзяцей, быдла і ўсё іншае, што будзе ў горадзе, усю здабычу ягоную
возьмеш сабе і будзеш есьці здабычу ворагаў тваіх, якую даў табе ГОСПАД, Бог твой.
15 Так зрабі з усімі гарадамі, якія ад цябе вельмі далёка, якія ня ёсьць гарадамі народаў гэтых.
16 Але ў гарадах народаў гэтых, якія ГОСПАД, Бог твой дае табе ў спадчыну, не пакінеш нікога
жывым,
17 але паложыш закляцьце на Хетаў, Амарэйцаў, Хананейцаў, Пэрэзэяў, Хівеяў і Евусэяў, як
загадаў табе ГОСПАД, Бог твой,
18 каб яны не навучылі вас усякім брыдотам сваім, якія рабілі яны багам сваім, і каб вы не
грашылі супраць ГОСПАДА, Бога вашага.
19 Калі будзеш аблягаць горад шмат дзён, каб ваяваць супраць яго і здабыць яго, ня нішчы
дрэваў ягоных, сьсякаючы іх сякераю. Будзеш есьці [плады] іхнія, а іх саміх не сьсякай. Ці ж
дрэва ў полі — гэта чалавек, каб ісьці і аблягаць яго?
20 А калі дрэва не надаецца на ежу, зьнішчы яго, і сьсячы яго, і пабудуй махіны [для аблогі]
гораду, які ваюе з табою, пакуль не здабудзеш яго.

Друг 21

1 Калі ў зямлі, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, на ўласнасьць будзе знойдзены [труп] забітага,
які ляжыць у полі, і невядома, хто забіў яго,
2 няхай выйдуць старшыні твае і судзьдзі твае, і адмераюць [адлегласьць] ад гарадоў, якія
вакол забітага.
3 І старшыні гораду, які будзе найбліжэй да забітага, возьмуць цялушку, якая яшчэ не
працавала і не насіла ярма,
4 і прывядуць старшыні гораду гэтага цялушку гэтую да ручая, які не высыхае, і на месца
неаранае і неабсеянае, і зломяць цялушцы карак каля ручая.
5 І прыйдуць сьвятары, сыны Левія, якіх выбраў ГОСПАД, Бог твой, каб служылі Яму і
дабраслаўлялі ў імя ГОСПАДА, і паводле [слова] з вуснаў іхніх будзе [вырашацца] ўсякая
спрэчная справа і справа скалечаньня.
6 Усе старшыні гораду, які найбліжэй да забітага, памыюць рукі свае над цялушкай, карак якой
зламалі каля ручая,
7 і адкажуць, і скажуць: “Рукі нашыя ня вылілі крыві гэтай, і вочы нашыя ня бачылі [нічога].
8 Адпусьці [правіну] народу Твайго, Ізраіля, які адкупіў Ты, ГОСПАДЗЕ, і не дазволь, каб гэтая
кроў нявінная была ў асяродзьдзі народу Твайго, Ізраіля”. І будзе адпушчана ім кроў гэтая.
9 І ты змыеш кроў нявінную спаміж сябе і зробіш тое, што справядлівае ў вачах ГОСПАДА.
10 Калі выйдзеш на вайну супраць ворагаў тваіх, і аддасьць іх ГОСПАД, Бог твой, у рукі твае, і
возьмеш палонных,
11 і ўбачыш між палоннымі жанчыну прыгожую, і закахаешся ў яе, і возьмеш яе за жонку сабе,
12 тады ўвядзеш яе ў дом твой, і яна абстрыжэ галаву сваю і абрэжа пазногці свае,

13 і скіне з сябе сукенку паланянкі, і будзе жыць у доме тваім, і будзе аплакваць бацьку свайго
і маці сваю [адзін] месяц. А потым увойдзеш да яе, і будзеш яе мужам, а яна будзе жонкай
тваёй.
14 Калі ж ты ня будзеш мець упадабання ў ёй, адпусьціш яе, куды [захоча] душа яе, і не прадасі
яе за срэбра, і ня ўчыніш з ёй, як з нявольніцай, бо ты ўпакорыў яе.
15 Калі нейкі муж будзе мець дзьве жонкі, і адну будзе любіць, а другую ненавідзець, і яны
народзяць яму сыноў, любая і зьненавіджаная, і першародным будзе сын зьненавіджанай,
16 у дзень, калі ён будзе даваць спадчыну сынам сваім, ня можа сына любай зрабіць
першародным, абмінаючы сына зьненавіджанай, які ёсьць першародным.
17 Сына зьненавіджанай прызнае першародным і дасьць яму з усяго, што мае, падвойную
частку, бо ён ёсьць пачатак сілы ягонай, і яму належыць права першародзтва.
18 Калі чалавек будзе мець сына непаслухмянага і ўпорыстага, які ня слухае голас бацькі
свайго і голас маці сваёй, і каралі яго, але ён ня слухаўся іх,
19 няхай бацька ягоны і маці ягоная возьмуць яго і прывядуць да старшыняў гораду свайго і да
брамы гораду свайго,
20 і скажуць старшыням гораду свайго: “Сын наш гэты непаслухмяны і ўпорысты, ня слухае
голасу нашага, аддаецца распусьце і п’янству”.
21 Тады ўсе мужчыны гораду ягонага ўкамянуюць яго камянямі, і ён памрэ, каб вынішчыць
зло з асяродзьдзя вашага. І ўвесь Ізраіль пачуе [гэта], і будзе баяцца.
22 Калі хто дапусьціцца злачынства, каранага сьмерцю, і будзе ён забіты і павесіш яго на дрэве,
23 труп ягоны ня будзе вісець на дрэве, але ў той самы дзень няхай будзе пахаваны, бо
пракляты Богам той, хто вісіць на дрэве. Не пагань зямлю тваю, якую даў табе на ўласнасьць
ГОСПАД, Бог твой.

Друг 22

1 Калі ўбачыш вала брата твайго або авечку ягоную, што заблукала, не пакідай іх, але вярні іх
брату твайму.
2 Калі ж брат твой ня блізка ад цябе і калі ня ведаеш яго, завядзі іх у дом твой і няхай будуць у
цябе, аж прыйдзе іх шукаць брат твой, і тады вернеш іх яму.
3 Так зробіш з аслом ягоным, так зробіш з плашчом ягоным, так зробіш з кожнаю згубленаю
[рэччу] брата твайго, [з усім], што ў яго згінула, а ты знайшоў; нельга табе ўхіліцца ад гэтага.
4 Калі ўбачыш асла брата твайго або вала ягонага, якія ўпалі на дарозе, не пакідай іх, але
падымі з ім разам.
5 Няхай ня будзе на жанчыне адзеньня мужчынскага, а мужчына няхай не апранае шаты
жаночыя; бо агідны ГОСПАДУ, Богу твайму, кожны, хто гэтак робіць.
6 Калі перад абліччам тваім знойдзеш на дарозе, на дрэве або на зямлі птушынае гняздо з
птушанятамі або з маткаю, якая выседжвае яйкі ці птушанятаў, не бяры маткі з птушанятамі.
7 Матку пусьці, а дзяцей вазьмі сабе, каб добра было табе і каб доўгімі былі дні [твае].
8 Калі пабудуеш новы дом, дык зрабі на даху тваім агароджу, каб не навесьці крыві на дом
твой, калі [нехта] зваліцца з яго.
9 Не засявай вінаградніку твайго двума гатункамі насеньня, каб не зрабіць табе заклятым і
збор насеньня, якое ты пасееш, і плады вінаградніку твайго.
10 Не ары на вале і асьле разам.
11 Не апранай [адзеньня], сатканага з воўны і лёну разам.
12 Зрабі сабе фрэнзьлі на чатырох канцах плашчу твайго, якім акрываешся.
13 Калі мужчына возьме жонку і ўвойдзе да яе, а [потым] зьненавідзіць яе,
14 і, закідаючы ёй ліхія ўчынкі, зьняславіць яе, і скажа: “Узяў я гэтую жанчыну, і ўвайшоў да
яе, але не знайшоў у яе дзявоцтва”,
15 тады бацька і маці дзяўчыны возьмуць і прынясуць [знакі] дзявоцтва дзяўчыны да
старшыняў гораду і да брамы,

16 і бацька дзяўчыны скажа старшыням: “Даў я дачку сваю чалавеку гэтаму за жонку, а ён яе
зьненавідзеў.
17 Вось, ён закідае ёй ліхія ўчынкі, кажучы: "Не знайшоў я ў дачкі тваёй дзявоцтва". Але вось
[доказы] дзявоцтва дачкі маёй”, — і раскладзе палатніну перад старшынямі гораду.
18 І возьмуць старшыні гораду мужчыну таго, і пакараюць яго,
19 І накладуць на яго сто [сыкляў] срэбра, і аддадуць іх бацьку дзяўчыны, бо ён зьняславіў імя
дзяўчыны Ізраіля; і яна застанецца жонкай ягонай, і ня будзе ён магчы кінуць яе ўсе дні свае.
20 Але калі праўдзівае было слова тое, бо не знайшліся [доказы] дзявоцтва дзяўчыны,
21 тады завядуць дзяўчыну тую да дзьвярэй дому бацькі ейнага і каменаваць яе будуць
камянямі мужчыны гораду гэтага аж да сьмерці, бо яна ўчыніла ганьбу ў Ізраілі, чынячы
распусту ў доме бацькі свайго. І вынішчыш зло з асяродзьдзя твайго.
22 Калі знойдзены будзе мужчына, які ляжыць з жанчынай, якая мае мужа, абое няхай
памруць, мужчына, які ляжаў з жанчынай, і жанчына. І вынішчыш ліхоцьце з Ізраіля.
23 Калі будзе дзяўчына, якая заручана мужу, і знойдзе яе [іншы] мужчына ў горадзе, і ляжа з
ёю,
24 абодвух прывядзіце да брамы гораду гэтага і ўкамянуйце іх камянямі да сьмерці. Дзяўчыну
за тое, што не крычала ў горадзе, а мужчыну за тое, што зьняважыў жонку бліжняга свайго. І
вынішчыш зло спаміж сябе.
25 А калі мужчына знайшоў у полі заручаную дзяўчыну і згвалціў яе, і лёг з ёю, няхай памрэ
адзін мужчына, які ляжаў з ёю,
26 а той дзяўчыне нічога не рабіце, бо яна не дапусьцілася грэху, [вартага] сьмерці, бо гэта
падобна на тое, калі хто паўстане супраць бліжняга свайго і адбярэ яму душу.
27 Бо яе знайшоў ён у полі, і дзяўчына заручаная крычала, але [ніхто] не дапамог ёй.
28 Калі мужчына знайшоў дзяўчыну, якая не заручаная, і схапіў яе, і лёг з ёю, і знойдуць іх,
29 той мужчына, які ляжаў з ёю, дасьць бацьку дзяўчыны пяцьдзясят [сыкляў] срэбра, і яна
будзе жонкай ягонай, таму што ён упакорыў яе, і ня будзе ён магчы кінуць яе ўсе дні свае.

Друг 23

1 Ніхто не павінен браць жонкі бацькі свайго і адкрываць крысо адзеньня бацькі свайго.
2 Той, хто мае струшчаныя яечкі або адрэзаны чэляс, ня ўвойдзе ў царкву ГОСПАДА.
3 Ня ўвойдзе байструк у царкву ГОСПАДА, нават у дзясятым пакаленьні ня ўвойдзе ён у царкву
ГОСПАДА.
4 Ня ўвойдзе Аманянін і Мааўлянін у царкву ГОСПАДА нават у дзясятым пакаленьні; ня ўвойдзе
ён у царкву ГОСПАДА на вякі,
5 за тое, што яны не сустрэлі вас з хлебам і вадой на шляху, калі вы ішлі з Эгіпту, і аплацілі
супраць цябе Білеама, сына Бэора, з Пэтору, што ў Арам-Нагараіме, каб цябе праклінаў.
6 Але ГОСПАД, Бог твой, не хацеў слухаць Білеама, і ГОСПАД, Бог твой, замяніў праклён
адносна цябе на дабраславенства, бо ГОСПАД, Бог твой, палюбіў цябе.
7 Ня будзеш жадаць для іх міру і дабрабыту ў-ва ўсе дні твае і на вякі.
8 Ня будзеш брыдзіцца Эдомцам, бо ён — брат твой. Ня будзеш брыдзіцца Эгіпціянінам, бо
прыхаднем ты быў у зямлі ягонай.
9 Сыны, якія народзяцца ім, у трэцім пакаленьні ўвойдуць у царкву ГОСПАДА.
10 Калі вырушыш табарам супраць ворагаў тваіх, сьцеражыся ад усякай справы ліхой.
11 Калі будзе ў цябе чалавек нячысты дзеля выпадку начнога, няхай выйдзе ён па-за табар і ня
ўвойдзе ў табар.
12 Увечары няхай памыецца ў вадзе, а пасьля заходу сонца ўвойдзе ў табар.
13 Будзеш мець месца па-за табарам, у якое будзеш хадзіць па патрэбе.
14 І будзе шуфлік сярод прыладаў тваіх, і калі выйдзеш навонкі, прыгатуеш [ямку], і,
вяртаючыся, прыкрыеш зямлёю тое, што выйшла з цябе.

15 Бо ГОСПАД, Бог твой, ходзіць пасярод табару твайго, каб ратаваць цябе і выдаваць ворагаў
тваіх перад абліччам тваім. Няхай табар твой будзе сьвяты, і нічога ў ім ня мае быць бачна
паганага, каб Ён не адвярнуўся ад цябе.
16 Не выдавай нявольніка, які да цябе ўцёк ад гаспадара свайго, гаспадару ягонаму.
17 Будзе ён жыць з табою, у месцы, якое ён выбраў у адной з брамаў тваіх, дзе будзе добра яму,
і ты не засмучай яго.
18 Ня будзе блудніцы сярод дачок Ізраіля, ані мужчыны блудніка сярод сыноў Ізраіля.
19 Не занясеш у Дом ГОСПАДА, Бога твайго, заробку распусьніцы і грошы сабакі, як
шлюбаваныя, бо ГОСПАД, Бог твой, брыдзіцца адным і другім.
20 Не вымагай ад брата свайго адсоткаў са срэбра, ці з харчаваньня, ці з кожнай рэчы, якую
пазычыш.
21 Ад чужога можаш вымагаць адсоткаў, але ад брата ня будзеш вымагаць адсоткаў, каб
ГОСПАД, Бог твой, дабраславіў цябе ў-ва ўсім, да чаго прыкладзеш ты руку тваю ў зямлі, якую
ідзеш авалодаць.
22 Калі складзеш шлюбаваньне ГОСПАДУ, Богу твайму, не марудзь выканаць яго, бо ГОСПАД,
Бог твой, запатрабуе гэтага ад цябе і будзе гэта табе як грэх.
23 Калі ўстрымаешся ад шлюбаваньня, ня будзе на табе грэху.
24 Тое, што выйшла з вуснаў тваіх, захоўвай і рабі, як абяцаў ты ГОСПАДУ, Богу твайму; з
уласнай волі і вуснамі сваімі ты [гэта] абяцаў.
25 Калі ўвойдзеш у вінаградзік бліжняга твайго, еш вінаград, колькі [падабаецца] душы тваёй,
але ў кошык твой не кладзі.
26 Калі ўвойдзеш у збожжа бліжняга твайго, рві каласы рукою тваёй, але сярпом ня жні.

Друг 24

1 Калі чалавек возьме жонку і станецца яе мужам, і яна ня знойдзе ласкі ў вачах ягоных, бо
ён знайшоў у ёй нешта паганае, няхай ён напіша ёй ліст разводны, дасьць яго ў рукі ейныя і
выправіць яе ў дом ейны.
2 А калі яна выйдзе з дому свайго, і пойдзе, і стане жонкаю іншага,
3 і зьненавідзіць яе другі муж, і напіша ёй ліст разводны, і дасьць яго ў рукі ейныя, і выправіць
яе ў дом ейны або калі памрэ другі муж, які ўзяў яе за жонку,
4 ня можа першы муж ейны, які выправіў яе, вярнуць яе і ўзяць за жонку, бо яна ўжо апаганена;
гэта брыдота перад абліччам ГОСПАДА. Не пагань зямлі, якую дае табе на ўласнасьць ГОСПАД,
Бог твой.
5 Калі чалавек нядаўна ўзяў жонку, няхай не ідзе ў войска і няхай не накладаецца на яго нейкі
абавязак [грамадзкі], але няхай застаецца вольны ў доме сваім і няхай адзін год радуецца з
жонкаю сваёй, якую ўзяў.
6 Нельга браць у заклад жорны ці камень млыновы, бо гэта [нібыта] браць душу ў заклад.
7 Калі будзе знойдзены чалавек, які схапіў душу [некага] з братоў сваіх, сыноў Ізраіля, і
зьняволіў яго, і прадаў яго, няхай памрэ злачынца, і вынішчыш зло спасярод сябе.
8 Захоўваючы, захоўвай пільна, калі [будзе] хвароба праказы, каб рабіць тое, чаму вучаць вас
сьвятары лявіты. Што я загадаў ім, тое выконвайце старанна.
9 Памятай, што зрабіў ГОСПАД, Бог твой, з Мірыям у дарозе, калі выйшлі вы з Эгіпту.
10 Калі бліжняму твайму пазычыш нейкую рэч, ня ўвойдзеш у дом ягоны, каб узяць нешта ў
заклад,
11 але будзеш стаяць звонку, а чалавек, якому ты пазычыў, прынясе табе заклад навонкі.
12 Калі гэта чалавек бедны, ня ляжаш спаць з закладам ягоным,
13 але зьвярні яму заклад да заходу сонца, каб спаў ён у адзеньні сваім і дабраславіў цябе, і
гэта будзе табе [залічана] ў праведнасьць перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго.
14 Не прыгнятай найміта, беднага і ўбогага, з братоў тваіх ці прыхадняў тваіх, якія ў зямлі
тваёй і ў брамах тваіх.

15 У той самы дзень аддай яму плату [за працу] ягоную, і няхай ня зойдзе над ёй сонца, бо ён
— бедны, і з гэтага жыве душа ягоная, каб ня клікаў ён супраць цябе ГОСПАДА і не было на табе
грэху.
16 Ня будуць паміраць бацькі за сыноў, і сыны ня будуць паміраць за бацькоў, але няхай кожны
памірае за грэх свой.
17 Не судзі крывадушна прыхадня і сіраты; і ад удавы не бяры адзеньня ў заклад.
18 Памятай, што ты быў нявольнікам у Эгіпце і выбавіў цябе адтуль ГОСПАД, Бог твой; дзеля
таго і я табе загадваю рабіць гэта.
19 Калі будзеш жаць жніво тваё на полі тваім і забудзешся снапа на полі, не вяртайся забраць
яго, але няхай застаецца ён для прыхадня, сіраты і ўдавы, каб дабраславіў цябе ГОСПАД, Бог
твой, у-ва ўсім, што будуць рабіць рукі твае.
20 Калі будзеш зьбіраць аліўкі твае, не пераглядай галінкі, але няхай застануцца [аліўкі] для
прыхадня, сіраты і ўдавы.
21 Калі будзеш зьбіраць вінаград твой, не зьбірай гронак, якія засталіся, але няхай будуць яны
для прыхадня, сіраты і ўдавы.
22 І памятай, што ты быў нявольнікам у зямлі Эгіпецкай. Дзеля гэтага я загадваю табе рабіць
гэта.

Друг 25

1 Калі будзе спрэчка паміж людзьмі, няхай яны стануць перад судом, і судзяць іх, і праведнага
прызнаюць нявінным, а вінаватага пакараюць.
2 Калі вінаваты будзе варты, каб яго білі, няхай паложаць яго [на зямлю] і будуць біць яго перад
абліччам судзьдзі, адпаведна правіны ягонай лічачы [ўдары].
3 Сорак удараў можа ён атрымаць, і нельга дадаваць [больш], каб біцьцё не было па-над меру,
і ня быў зьнявечаны брат твой перад вачыма тваімі.
4 Не завязвай пысы валу, які малоціць.
5 Калі браты жывуць сумесна і адзін з іх памрэ, і ня будзе мець сына, ня выйдзе жонка
памёршага замуж за мужа іншага, але швагер ейны прыйдзе да яе і возьме яе за жонку сабе, і
будзе жыць з ёю.
6 І станецца, што сыну першароднаму, якога яна народзіць, дадуць імя памёршага брата, і не
загіне імя ягонае ў Ізраілі.
7 А калі той мужчына не захоча узяць братавай сваёй за жонку, пойдзе братавая ў браму
[гораду] да старшыняў і скажа: “Швагер мой адмаўляецца аднавіць імя брата свайго ў Ізраілі,
ня хоча жыць са мною”.
8 І старшыні гораду ягонага паклічуць яго і запытаюцца ў яго. І калі ён адмовіцца і скажа: “Не
хачу яе ўзяць за жонку”,
9 тады братавая падыйдзе да яго на вачах старшыняў і здыме сандал ягоны з нагі ягонай, і
плюне яму ў твар, і адкажа, і скажа: “Так робяць з чалавекам, які ня хоча адбудаваць дом
брата свайго”.
10 І будзе названа імя ягонае ў Ізраілі: “Дом разутага”.
11 Калі будуць біцца паміж сабою мужчыны, адзін супраць другога, і наблізіцца жонка аднаго
з іх, каб вырваць мужа з рук таго, хто б’е, і выцягне руку сваю, і схопіць яго за сорам ягоны,
12 адрэжаш ёй далонь, няхай не шкадуе яе вока тваё.
13 Няхай ня будзе ў торбе тваёй камянёў вагавых большых і меншых.
14 Няхай ня будзе ў доме тваім эфы большай і меншай.
15 Камень вагавы няхай будзе праведны і дакладны; і эфа няхай будзе ў цябе дакладная і
праведная, каб доўгія былі дні твае на зямлі, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой.
16 Бо брыдзіцца ГОСПАД, Бог твой, кожным, хто так робіць, кожным, хто чыніць беззаконьне.
17 Памятай, што зрабіў табе ў дарозе Амалек, калі выйшаў ты з Эгіпту.
18 Ён сустрэў цябе на шляху і забіў сярод цябе ўсіх змучаных у апошніх шэрагах тваіх, а ты быў
змораны і зьняможаны, і ён не баяўся Бога.

19 Калі ГОСПАД, Бог твой, дасьць табе супакой ад усіх ворагаў тваіх, якія вакол цябе, у зямлі,
якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, у спадчыну, каб ты авалодаў ёю, ты сатрэш памяць пра
Амалека пад небам. Не забудзься [пра гэта].

Друг 26

1 Калі ўвойдзеш у зямлю, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, у спадчыну, і ты авалодаеш ёю, і
абжывешся ў ёй,
2 возьмеш пяршыны з усіх пладоў зямлі, якія зьбярэш у зямлі тваёй, якую дае табе ГОСПАД,
Бог твой, і ўложыш іх у кошык, і пойдзеш на месца, якое ГОСПАД, Бог твой, выбраў, каб было
там імя Ягонае.
3 І прыйдзеш да сьвятара, які будзе ў тыя дні, і скажаш яму: “Абвяшчаю сёньня перад
ГОСПАДАМ, Богам тваім, што я ўвайшоў у зямлю, якую ГОСПАД запрысяг бацькам нашым, што
дасьць яе нам”.
4 І возьме сьвятар кошык з рукі тваёй, і паставіць перад ахвярнікам ГОСПАДА, Бога твайго,
5 а ты адкажаш і скажаш перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго: “Бацька мой, вандроўны
Арамеец, прыйшоў у Эгіпет, і завандраваў туды малой грамадкай, і стаўся там народам
вялікім, дужым і шматлікім.
6 І прыгняталі нас Эгіпцяне, і перасьледавалі нас, і накладалі на нас цяжкія працы.
7 І мы клікалі да ГОСПАДА, Бога бацькоў нашых. І Ён впачуў крык наш, і ўбачыў пакуты нашыя,
і працу нашую, і ўціск наш.
8 І вывеў нас ГОСПАД, Бог наш, рукою моцнаю і рамяном узьнятым сярод вялікага страху,
знакаў і цудаў,
9 і прывёў нас у гэтае месца, і даў нам зямлю, якая ацякае малаком і мёдам.
10 І вось цяпер я прынёс пяршыны пладоў зямлі, якую даў мне ГОСПАД”. І паложыш іх перад
абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, і паклонішся перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго.
11 І будзеш радавацца ў-ва ўсіх даброцьцях, якія даў ГОСПАД, Бог твой, табе і дому твайму, ты,
і лявіт, і прыхадзень, які ў цябе.
12 Калі ў трэцім годзе, годзе дзесяціны, аддзеліш усе дзесяціны з усіх пладоў тваіх і аддасі іх
лявіту, прыхадню, сіраце і ўдаве, і яны будуць есьці ў брамах тваіх, і насыцяцца,
13 тады скажаш перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго: “Узяў я з дому свайго тое, што сьвятое,
і даў лявіту, прыхадню, сіраце і ўдаве, паводле ўсіх прыказаньняў Тваіх, як Ты загадаў мне. Я
не парушыў прыказаньняў Тваіх і не забыўся [пра іх].
14 Не спажываў я іх у [дзень] жалобы, ня ўзяў нічога з іх, калі быў нячысты, не даваў з іх нічога
памёршаму. Я слухаў голас ГОСПАДА, Бога майго, і зрабіў усё, што Ты загадаў мне.
15 Дык глянь са сьвятой Сялібы Тваёй, з неба, і дабраславі народ Твой, Ізраіля, і зямлю, якую
Ты даў нам, як прысягаў бацькам нашым, зямлю, якая ацякае малаком і мёдам”.
16 Сёньня ГОСПАД, Бог твой, загадвае табе, каб ты выконваў пастановы гэтыя і прысуды, і
захоўваў, і выконваў гэта ўсім сэрцам тваім і ўсёю душою тваёй.
17 Ты выбраў сёньня ГОСПАДА, каб быў Ён табе Богам, і каб ты хадзіў шляхамі Ягонымі і
захоўваў пастановы Ягоныя, прыказаньні Ягоныя і прысуды Ягоныя, і слухаўся голасу Ягонага.
18 А ГОСПАД выбраў цябе сёньня, каб ты быў Яму народам выбраным, як Ён прамаўляў табе, і
каб ты выконваў усе прыказаньні Ягоныя.
19 І Ён узвысіць цябе ў пашане, іменьні і славе па-над усімі народамі, якія Ён учыніў, каб ты
быў для ГОСПАДА, Бога твайго, народам сьвятым, як Ён прамаўляў».

Друг 27

1 І загадаў Майсей і старшыні Ізраіля народу, кажучы: «Захавайце ўсе прыказаньні, які я вам
загадваю сёньня.
2 І станецца ў дзень, калі пяройдзеш Ярдан і ўвойдзеш у зямлю, якую дае табе ГОСПАД, Бог
твой, пастаў вялікія камяні, і абмаж іх вапнай,

3 і напішы на іх усе словы Закону гэтага, калі ты пяройдзеш [Ярдан], каб увайсьці ў зямлю,
якую дае табе ГОСПАД, Бог твой, у зямлю, якая ацякае малаком і мёдам, як прамовіў да цябе
ГОСПАД, Бог бацькоў тваіх.
4 І станецца, калі пяройдзеце Ярдан, пастаўце гэтыя камяні, як я загадваю вам сёньня, на гары
Эваль і абмажце іх вапнай.
5 І пабудуеш там ахвярнік ГОСПАДУ, Богу твайму, ахвярнік з камянёў, якіх не кранула жалеза,
6 З камянёў нячэсаных пабудуеш ахвярнік ГОСПАДУ, Богу твайму, і складзеш на ім
цэласпаленьні ГОСПАДУ, Богу твайму.
7 І складзеш ахвяру мірную, і будзеш есьці там, і радавацца перад абліччам ГОСПАДА, Бога
твайго.
8 І напішы на камянях усе словы Закону гэтага выразна і добра».
9 І прамовілі Майсей і сьвятары лявіты да ўсяго Ізраіля, кажучы: «Маўчы і слухай, Ізраіль. У
дзень сёньняшні ты стаўся народам ГОСПАДА, Бога твайго.
10 Будзеш слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і выконваць прыказаньні Ягоныя і пастановы
Ягоныя, якія я загадваю табе сёньня».
11 У той дзень загадаў Майсей народу, кажучы:
12 «Калі пяройдзеце Ярдан, стануць на гары Гарызім, каб дабраслаўляць народ, Сымон, Левій,
Юда, Ісахар, Язэп і Бэн'ямін.
13 А на гары Эваль для праклінаньня будуць стаяць Рубэн, Гад, Асэр, Завулён, Дан і Нэфталі.
14 І адкажуць лявіты, і будуць казаць гучным голасам да ўсіх мужоў Ізраіля:
15 "Пракляты чалавек, які зробіць выяву рэзьбленую або літую, брыдоту перад ГОСПАДАМ,
твор рук рамесьніка, і паставіць яго ў месцы схаваным!" І адкажа ўвесь народ, і скажа: "Амэн".
16 "Пракляты той, хто зьневажае бацьку свайго і маці сваю". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
17 "Пракляты той, хто перасоўвае мяжу бліжняга свайго". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
18 "Пракляты той, хто падманвае сьляпога ў дарозе". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
19 "Пракляты той, хто перакручвае суд прыхадню, сіраце і ўдаве". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
20 "Пракляты той, хто лажыцца з жонкай бацькі свайго, бо ён адкрыў плашч бацькі свайго". І
ўвесь народ скажа: "Амэн".
21 "Пракляты той, хто лажыцца з усялякай жывёлаю". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
22 "Пракляты той, хто лажыцца з сястрой сваёй, з дачкой бацькі свайго або дачкой маці сваёй".
І ўвесь народ скажа: "Амэн".
23 "Пракляты той, хто лажыцца з цешчай сваёй". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
24 "Пракляты той, хто таемна забівае бліжняга свайго". І ўвесь народ скажа: "Амэн".
25 "Пракляты той, хто бярэ хабар, каб забіць душу і [праліць] кроў нявінную". І ўвесь народ
скажа: "Амэн".
26 "Пракляты той, хто не трымаецца словаў Закону гэтага, і не выконвае іх". І ўвесь народ
скажа: "Амэн".

Друг 28

1 І станецца, калі ты будзеш, слухаючы, слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўваць, і
выконваць усе прыказаньні Ягоныя, якія я загадваю табе сёньня, ГОСПАД, Бог твой, узвысіць
цябе па-над усе народы зямлі,
2 і сплывуць на цябе ўсе гэтыя дабраславенствы, і споўняцца на табе, калі будзеш слухаць голас
ГОСПАДА, Бога твайго.
3 Дабраслаўлёны ты ў горадзе і дабраслаўлёны ў полі.
4 Дабраслаўлёны плод улоньня твайго і плод зямлі тваёй, плод жывёлы тваёй, і нараджэньне
валоў тваіх, і прыплод авечак тваіх.
5 Дабраслаўлёны кош твой і дзяжа твая.
6 Дабраслаўлёны ты пры ўваходзе тваім і дабраслаўлёны пры выхадзе тваім.
7 Дасьць табе ГОСПАД, што ворагі твае, якія паўстаюць супраць цябе, будуць пабітыя перад
абліччам тваім. Адным шляхам яны пойдуць супраць цябе, а сямёма шляхамі ўцякуць ад цябе.

8 Загадае ГОСПАД, каб [было] дабраславенства на сьвірнах тваіх і на ўсякай працы рук тваіх; і
будзе Ён дабраслаўляць цябе ў зямлі, якую дае табе ГОСПАД, Бог твой.
9 Паставіць цябе ГОСПАД як народ сьвяты, як запрысяг табе, калі будзеш захоўваць
прыказаньні ГОСПАДА, Бога твайго, і хадзіць шляхамі Ягонымі.
10 І ўбачаць усе народы зямлі, што імя ГОСПАДА заклікаюць над табою, і будуць баяцца цябе.
11 І дасьць табе ГОСПАД па-над меру даброцьцяў; у плодзе улоньня твайго, і ў прыплодзе
жывёлы тваёй, і ў плодзе зямлі тваёй, у зямлі, якую запрысяг ГОСПАД даць табе.
12 Адкрые табе ГОСПАД шчодрыя скарбы нябесныя, каб даць у свой час дождж зямлі тваёй і
дабраславіць ўсе працы рук тваіх. І ты будзеш пазычаць шматлікім народам, а сам ня будзеш
браць пазыкі.
13 І зробіць цябе ГОСПАД галавою, а не хвастом, і будзеш ты толькі на версе, і ня будзеш у нізе,
калі будзеш слухаць прыказаньні ГОСПАДА, Бога твайго, якія сёньня я загадваю табе, каб ты
захоўваў і выконваў іх.
14 І не адступай ад кожнага слова, якія я загадваю табе сёньня, ані ўправа, ані ўлева, і не ідзі
за багамі чужымі, і не служы ім.
15 І станецца, калі ня будзеш слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўваць, і выконваць усе
прыказаньні Ягоныя і пастановы Ягоныя, якія я сёньня загадваю табе, тады прыйдуць на цябе
ўсе гэтыя праклёны і споўняцца на табе.
16 Пракляты ты ў горадзе і пракляты ў полі.
17 Пракляты кош твой і дзяжа твая.
18 Пракляты плод улоньня твайго і плод зямлі тваёй, нараджэньне валоў тваіх і прыплод
авечак тваіх.
19 Пракляты ты пры ўваходзе тваім і пракляты пры выхадзе тваім.
20 Спашле на цябе ГОСПАД праклён, і трывогу, і няшчасьце ў-ва ўсіх працах рук тваіх, якія
будзеш рабіць, пакуль Ён ня зьнішчыць цябе і не прападзеш ты хутка з прычыны ліхіх учынкаў
тваіх, праз якія ты пакінуў Мяне.
21 І спашле на цябе ГОСПАД пошасьць, пакуль ня выкараніць цябе з зямлі, у якую ты ідзеш, каб
авалодаць ёю.
22 Дакранецца цябе ГОСПАД сухотамі, гарачкаю, трасцай, сьпякотаю, мячом, сушаю і іржою.
Яны будуць перасьледаваць цябе, пакуль ты ня будзеш зьнішчаны.
23 І неба, якое над галавой тваёй, зробіцца медзьдзю, а зямля пад табою — жалезам.
24 Пераменіць ГОСПАД дождж на зямлі тваёй у парахно і пыл, з неба будуць падаць яны на
цябе, пакуль ня зьнішчаць цябе.
25 І зробіць табе ГОСПАД, што ты будзеш пабіты перад абліччам ворагаў тваіх; адным шляхам
будзеш ісьці на іх, а сямёма шляхамі будзеш уцякаць ад іх, і станеш ты страхоцьцем для ўсіх
валадарстваў зямлі.
26 Парэшткі твае будуць пажываю ўсім птушкам паднебным і зьвярам зямным, і [ніхто] ня
будзе адганяць [іх].
27 Дакранецца цябе ГОСПАД скуламі Эгіпецкімі і балячкамі, каростаю і паршывасьцю, якіх ня
зможаш вылечыць.
28 Дакранецца цябе ГОСПАД вар’яцтвам, сьлепатою і неспакоем сэрца.
29 Апоўдні будзеш хадзіць навобмацак, як сьляпы навобмацак ходзіць у поцемках, і на ўсіх
шляхах тваіх ня будзеш мець посьпеху. І будзеш ты крыўджаны і рабаваны ўсе дні, і [ніхто]
ня будзе ратаваць цябе.
30 Заручышся з жонкай, а іншы мужчына будзе спаць з ёй. Пабудуеш дом, але ня будзеш жыць
у ім, пасадзіш вінаградник, але не зьбярэш пладоў ягоных.
31 Вол твой будзе забіты на вачах у цябе і ня будзеш есьці яго. Асёл твой будзе забраны спрад
аблічча твайго і ня вернецца да цябе; авечкі твае будуць аддадзены ворагам тваім, і [ніхто] ня
будзе ратаваць цябе.
32 Сыны твае і дочкі твае будуць аддадзены іншаму народу, і вочы твае будуць выглядаць іх
сумаваць дзеля іх усе дні, і ня будзе сілы ў руках тваіх.

33 Плады зямлі тваёй і ўвесь набытак твой зьесьць народ, якога ня ведаеш, і будзеш ты толькі
крыўджаны і прыгнятаны ўсе дні.
34 І ты звар'яцееш, бачачы тое, што ўбачаць вочы твае.
35 Дакранецца цябе ГОСПАД балючымі скуламі на каленях і нагах, і ня зможаш вылечыцца, і
[пакрыюць] яны цябе ад стопаў аж да чубу галавы.
36 Цябе і валадара твайго, якога ты паставіш над сабою, завядзе ГОСПАД да народу, якога ня
ведаў ты і бацькі твае, і будзеш служыць там багам чужым, дрэву і камяню,
37 і будзеш страхоцьцем, і прыказкай, і пасьмешышчам для ўсіх народаў, да якіх завядзе цябе
ГОСПАД.
38 Насеньня шмат кінеш у поле, а зьбярэш мала, бо саранча паесьць яго.
39 Вінаграднікі пасадзіш, будзеш даглядаць, а віна піць ня будзеш, і нічога з іх не зьбярэш, бо
будуць паедзены чарвякамі.
40 Аліўкі будзеш мець у-ва ўсіх межах тваіх, але ня выцісьнеш алею, бо змарнеюць аліўкі твае.
41 Народзіш сыноў і дачок, але ня будуць з табою, бо павядуць іх у няволю.
42 Усе дрэвы твае і плод зямлі тваёй паядуць жужлы.
43 Прыхадзень, які [жыве] з табою, будзе падымацца па-над цябе вышэй і вышэй, а ты будзеш
зыйходзіць ніжэй і ніжэй.
44 Ён будзе пазычаць табе, а ты не пазычыш яму; ён будзе галавой, а ты будзеш хвастом.
45 І прыйдуць на цябе ўсе гэтыя праклёны, і будуць цябе перасьледваць, і дагоняць цябе,
пакуль не загінеш, бо ты ня слухаў ГОСПАДА, Бога твайго, і не захоўваў прыказаньняў Ягоных
і пастановаў Ягоных, якія Ён загадаў табе.
46 І будзе [гэта] знакам і цудоўным [дзеяньнем] табе і насеньню твайму на вякі.
47 За тое, што ты не служыў ГОСПАДУ, Богу твайму, з радасьцю і добрасьцю сэрца твайго,
[маючы] мноства ўсяго,
48 будзеш служыць ворагам тваім, якіх ГОСПАД спашле на цябе, у голадзе і смазе, у голасьці і
нястачы ўсяго, і яны павесяць ярмо жалезнае на карак твой, пакуль ня вынішчаць цябе.
49 Прывядзе на цябе ГОСПАД народ далёкі; з канца зямлі, як арол, наляціць народ гэты, мовы
якога ты ня чуў,
50 народ з жудасным абліччам, які не ўшануе аблічча старога і не пашкадуе юнака.
51 І ён зжарэ плод жывёлы тваёй і плод зямлі тваёй, аж пакуль ня вынішчыць цябе. І ён не
пакіне табе пшаніцы, віна і алею, прыплоду валоў тваіх і прыплоду авечак тваіх, аж пакуль ня
вынішчыць цябе.
52 І возьме ён у аблогу цябе ў-ва ўсіх брамах тваіх, пакуль не разваліць муры твае моцныя і
высокія, у якіх ты меў надзею, у-ва ўсёй зямлі тваёй. І будзе трымаць цябе ў аблозе ў-ва ўсіх
брамах тваіх у-ва ўсёй зямлі, якую даў табе ГОСПАД, Бог твой.
53 І будзеш ты есьці плод улоньня твайго, целы сыноў тваіх і дачок тваіх, якіх даў табе ГОСПАД,
Бог твой, у аблозе і ў бядзе, якімі прыцісьне цябе вораг твой.
54 У цябе чалавек чульлівы і вельмі далікатны будзе глядзець ліхім вокам на брата свайго і на
жонку ўлоньня свайго, і на рэшту сыноў сваіх, якія засталіся [ў яго].
55 Ня дасьць [нікому] ён целы сыноў сваіх, якія будзе есьці, бо нічога больш не застанецца ў
яго ў аблозе і ў бядзе, якімі вораг твой прыцісьне цябе ў-ва ўсіх брамах тваіх.
56 Жанчына ў цябе, вельмі чульлівая і далікатная, што не хацела нагі паставіць на зямлю дзеля
далікатнасьці і расьпешчанасьці, будзе глядзець ліхім вокам на мужа ўлоньня свайго, на сына
свайго і на дачку сваю
57 і ня дасьць ім пасьледу свайго, які выйшаў спаміж ног ейных, і сыноў сваіх, якіх нарадзіла,
бо будзе есьці іх таемна дзеля нястачы ўсяго ў аблозе і бядзе, якімі прыцісьне цябе вораг твой
у-ва ўсіх брамах тваіх.
58 Калі ня будзеш захоўваць і выконваць усіх словаў Закону гэтага, якія напісаныя ў кнізе гэтай,
і ня будзеш баяцца гэтага слаўнага і страшнага імя ГОСПАДА, Бога твайго,
59 шмат больш павялічыць ГОСПАД плягі на цябе і плягі на насеньне тваё, і плягі вялікія і
доўгатрывалыя, і хваробы ліхія і доўгатрывалыя,

60 і навядзе на цябе ўсе хваробы Эгіпецкія, якіх ты баяўся, і прылепяцца яны да цябе.
61 І ўсе хваробы і ўсе плягі, якія не запісаныя ў кнізе Закону гэтага, спашле ГОСПАД на цябе,
пакуль ня будзеш вынішчаны.
62 І застанецёся вы ў малой лічбе, хоць раней вы былі, як зоркі ў небе, у колькасьці сваёй, бо
ня слухаў ты голас ГОСПАДА, Бога твайго.
63 Як перад гэтым цешыўся ГОСПАД з вас, добра вам робячы і памнажаючы вас, так будзе
цешыцца ГОСПАД з вас, нішчачы вас і сьціраючы з зямлі, у якую ты ідзеш, каб авалодаць ёю.
64 І ГОСПАД расьцярушыць вас сярод усіх народаў, ад канца зямлі да канца зямлі, і там будзеш
ты служыць багам чужым, якіх ня ведаў ты і бацькі твае, дрэву і камяням.
65 І ня будзеш ты мець супакою ў гэтых народаў, і ня будзе мець супачынку стапа нагі тваёй. І
дасьць там табе ГОСПАД сэрца дрыготкае, вочы заплаканыя і душу збалелую.
66 І будзе жыцьцё тваё вісець перад табою; будзеш баяцца ўначы і ўдзень, і ня будзеш пэўны
жыцьця свайго.
67 Раніцаю ты скажаш: “Хто дасьць мне [дачакацца] вечара?”, а ўвечары скажаш: “Хто дасьць
мне [дачакацца] раніцы?”, дзеля страху сэрца твайго, якое будзе баяцца ўсяго таго, што
ўбачаць вочы твае.
68 І верне цябе ГОСПАД у Эгіпет на караблях шляхам, пра які Ён казаў табе, што ты яго больш
ня ўбачыш. Там будзеце вы прададзеныя ворагам вашым як нявольнікі і нявольніцы, і [ніхто]
ня будзе купляць»

Друг 29

1 Гэта словы запавету, які загадаў ГОСПАД Майсею заключыць з сынамі Ізраіля ў зямлі Мааў,
апрача запавету, які заключыў з імі на Харэве.
2 І склікаў Майсей увесь Ізраіль, і сказаў ім: «Вы бачылі ўсё, што зрабіў ГОСПАД на вачах вашых
у зямлі Эгіпецкай фараону і ўсім слугам ягоным, і ўсёй зямлі ягонай,
3 тыя вялікія плягі, якія бачылі вочы вашыя, знакі і цуды вялікія.
4 І ня даў вам ГОСПАД сэрца, якое разумее, вачэй, якія бачаць, і вушэй, якія чуюць, аж да
сёньняшняга дня.
5 І вёў я вас сорак гадоў праз пустыню; ня сьцёрліся адзеньні вашыя, сандалы вашыя на нагах
вашых не падраліся.
6 Хлеба вы ня елі, віна і сікеры не пілі, каб вы ведалі, што Я — ГОСПАД, Бог ваш.
7 І прыйшлі вы на месца гэтае, і выйшлі Сыгон, валадар Хешбону, і Ог, валадар Башану, супраць
вас вайною, і мы іх пабілі.
8 І забралі мы зямлю іхнюю, і аддалі яе на ўласнасьць [сынам] Рубэна і Гада і палове калена
Манасы.
9 Дык захоўвайце словы запавету гэтага і выконвайце іх, каб мелі вы посьпех у-ва ўсім, што
будзеце рабіць.
10 Вы стаіцё сёньня ўсе перад абліччам ГОСПАДА, Бога вашага; начальнікі каленаў вашых,
старшыні вашыя, наглядчыкі вашыя і кожны Ізраільцянін,
11 дзеці вашыя і жонкі вашыя, і прыхадзень твой, які ў сярэдзіне табару твайго, [пачынаючы]
ад тых, якія сякуць дровы, аж да тых, якія чэрпаюць ваду,
12 каб увайшоў ты ў запавет з ГОСПАДАМ, Богам тваім, і прысягай [запячатаў] тое, што сёньня
ГОСПАД, Бог твой, заключыў з табою,
13 каб паставіць цябе сёньня як народ Ягоны, і каб Ён быў Богам тваім, як абяцаў табе і як
запрысяг Ён бацькам тваім, Абрагаму, Ісааку і Якубу.
14 Ня толькі з вамі аднымі заключаю я гэты запавет і [зацьвярджаю] яго прысягай,
15 але з тымі, хто тут з намі стаяць перад абліччам ГОСПАДА, Бога нашага, і з тымі, каго сёньня
тут няма з намі.
16 Бо вы ведаеце, як мы жылі ў зямлі Эгіпецкай і як ішлі між народамі, праз якія вы прайшлі.
17 І вы бачылі брыдоты іхнія і ідалаў іхніх, дрэвы і камяні, срэбра і золата, якія ў іх.

18 Няхай ня будзе сярод вас мужчыны або жанчыны, сям'і або пакаленьня, сэрца якога
адвярнулася ад ГОСПАДА, Бога вашага, каб ісьці і служыць багам гэтых народаў. Няхай ня
будзе паміж вас корань, які родзіць атруту і палын.
19 Калі нехта пачуе словы прысягі гэтай і будзе патураць сабе ў сэрцы сваім, кажучы: "Супакой
мець буду, хоць буду хадзіць у закамянеласьці сэрца майго", той сьцягвае загубу [на зямлю],
як наводненую, так і сухую.
20 ГОСПАД не даруе яму, але тады ўзгарыцца гнеў ГОСПАДА і лютасьць Ягоная супраць
чалавека таго, і прыйдуць на яго ўсе праклёны, запісаныя ў кнізе гэтай, і выкрасьліць ГОСПАД
імя ягонае пад небам,
21 і аддзеліць яго ГОСПАД на загубу з усіх каленаў Ізраіля, паводле ўсіх праклёнаў запавету,
запісаных у гэтай кнізе Закону.
22 І пакаленьні наступныя, сыны вашыя, якія паўстануць пасьля вас, і чужынец, які прыйшоў з
зямлі далёкай, убачаць плягі зямлі гэтай і немачы ейныя, якія спашле на яе ГОСПАД, і скажуць:
23 "Серка і соль, і пажарышча на ўсёй зямлі. Ня будзе яна больш засяваная і не зазелянее яна,
і ня вырасьце на ёй аніякая трава, як пасьля загубы Садома і Гаморы, Адмы і Цэвоіма, якія
ГОСПАД зьнішчыў у гневе Сваім і ў ярасьці Сваёй".
24 І скажуць усе народы: "За што ГОСПАД зрабіў так зямлі гэтай? Чаму такі вялікі жар гневу
Ягонага?"
25 І адкажуць: "За тое, што пакінулі яны запавет ГОСПАДА, Бога бацькоў іхніх, які заключыў
Ён з імі, калі вывеў іх з зямлі Эгіпецкай,
26 і пайшлі, і служылі багам чужым, і пакланяліся багам, якіх ня ведалі, і якіх Ён ім не
прызначыў.
27 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА супраць зямлі гэтай, і Ён спаслаў на яе ўсе праклёны, запісаныя ў
кнізе гэтай.
28 І выгнаў ГОСПАД іх з зямлі іхняй у гневе, ярасьці і абурэньні вялікім, і выгнаў іх у зямлю
чужую, як гэта ёсьць сёньня".
29 Схаванае [належыць] ГОСПАДУ, Богу нашаму, а адкрытае — нам і сынам нашым аж на вякі,
каб мы выконвалі ўсе словы Закону гэтага.

Друг 30

1 І станецца, што прыйдуць на цябе ўсе словы гэтыя дабраславенства і праклёну, якія я
абвясьціў перад абліччам тваім, і ты возьмеш іх у сэрца сваё сярод усіх народаў, да якіх выгнаў
цябе ГОСПАД, Бог твой.
2 І ты вернешся да ГОСПАДА, Бога твайго, і будзеш слухаць голас Ягоны ў-ва ўсім, што я сёньня
загадваю табе, ты і сыны твае, усім сэрцам тваім і ўсёй душою тваёй.
3 І адменіць ГОСПАД, Бог твой, няволю тваю і зьлітуецца над табою, і верне цябе, і зьбярэ цябе
з усіх народаў, у якіх расьцярушыў цябе ГОСПАД, Бог твой.
4 Хоць бы ты быў выгнаны на канец неба, адтуль сьцягне і адтуль зьбярэ цябе ГОСПАД, Бог
твой, і зграмадзіць цябе.
5 І ўвядзе цябе ГОСПАД, Бог твой, у зямлю, якую мелі бацькі твае, і возьмеш яе на ўласнасьць і
Ён дасьць дабрабыт табе, і павялічыць цябе больш за бацькоў тваіх.
6 І абрэжа ГОСПАД, Бог твой, сэрца тваё і сэрца насеньня твайго, каб любіў ты ГОСПАДА, Бога
твайго, усім сэрцам тваім і ўсёю душою тваёй, каб ты жыў.
7 І зьверне ГОСПАД, Бог твой, усе гэтыя праклёны на ворагаў тваіх і на тых, якія ненавідзяць
цябе і перасьледуюць цябе.
8 А ты навернешся, і будзеш слухаць голас ГОСПАДА, і будзеш выконваць усе прыказаньні
Ягоныя, якія я загадваю табе сёньня.
9 І ГОСПАД, Бог твой, дасьць табе посьпех у-ва ўсіх працах рук тваіх, у пладах улоньня твайго,
і ў прыплодзе жывёлы тваёй, і ў плодзе зямлі тваёй табе на дабро. Бо вернецца ГОСПАД, каб
цешыцца з цябе, [даючы] даброцьці, як цешыўся Ён з бацькоў тваіх,

10 калі будзеш слухаць голас ГОСПАДА, Бога твайго, і захоўваць прыказаньні Ягоныя і
пастановы Ягоныя, якія запісаныя ў кнізе Закону гэтага, і калі навернешся да ГОСПАДА, Бога
твайго, усім сэрцам тваім і ўсёй душой тваёй.
11 Бо прыказаньне гэтае, якое я загадваю табе сёньня даю, не зацяжкае для цябе і не далёкае
[ад цябе].
12 Ня ў небе яно, каб ты казаў: “Хто ўзыйдзе ў неба і прынясе яго нам, каб мы маглі пачуць яго
і выканаць яго?”
13 І не за морам яно, каб ты казаў: “Хто пераплыве мора і прынясе яго да нас, каб мы маглі
пачуць яго і выканаць яго?”
14 Але вельмі блізка да цябе слова гэтае, яно ў вуснах тваіх і ў сэрцы тваім, каб ты мог выканаць
яго.
15 Глядзі, я кладу сёньня перад абліччам тваім жыцьцё і дабро, сьмерць і зло.
16 Бо я загадваю табе сёньня, каб любіў ты ГОСПАДА, Бога твайго, і хадзіў шляхамі Ягонымі,
і захоўваў прыказаньні Ягоныя, і пастановы Ягоныя, і прысуды Ягоныя, будзеш жыць, і
памножышся, і будзе дабраслаўляць цябе ГОСПАД, Бог твой, у зямлі, якую ідзеш атрымаць
на ўласнасьць.
17 А калі адвернецца сэрца тваё і ня будзеш слухаць [Госпада], і будзеш зьведзены, і будзеш
пакланяцца багам чужым, і будзеш ім служыць,
18 я паведамляю вам сёньня, што, гінучы, вы загінеце і ня будуць доўгія дні [вашыя] ў зямлі, у
якую ты пераходзіш праз Ярдан і ідзеш туды, каб атрымаць яе на ўласнасьць.
19 За сьведкаў супраць вас сёньня клічу неба і зямлю, што я кладу перад абліччам тваім жыцьцё
і сьмерць, дабраславенства і праклён. Выбірай жыцьцё, каб жыў ты і насеньне тваё,
20 і любі ГОСПАДА, Бога твайго, і слухай голас Ягоны, і туліся да Яго, бо Ён — жыцьцё тваё
і доўгасьць дзён твіх, каб ты жыў на зямлі, якую абяцаў ГОСПАД бацькам тваім, Абрагаму,
Ісааку і Якубу, што дасьць ім яе».

Друг 31

1 І пайшоў Майсей, і прамовіў гэтыя словы да ўсяго Ізраіля,
2 і сказаў ім: «Я маю сёньня сто дваццаць гадоў. Не магу больш выходзіць і ўваходзіць, і
ГОСПАД сказаў мне: “Не пяройдзеш ты Ярдан гэты”.
3 ГОСПАД, Бог твой, Сам пяройдзе перад абліччам тваім. Ён зьнішчыць народы гэтыя перад
абліччам тваім, і ты завалодаеш імі, і Егошуа пойдзе перад абліччам тваім, як прамовіў
ГОСПАД.
4 І зробіць ім ГОСПАД, як зрабіў Сыгону і Огу, валадарам Амарэйцаў, і зямлі іхняй, зьнішчыўшы
іх.
5 І выдасьць ГОСПАД іх вам, і зробіце вы з імі паводле ўсіх прыказаньняў, якія я загадаў вам.
6 Будзьце цьвёрдыя і мужныя, ня бойцеся і не палохайцеся іх, бо ГОСПАД, Бог твой, ідзе з табою,
Ён не пакіне цябе і не адступіцца ад цябе».
7 І паклікаў Майсей Егошуа, і сказаў яму на вачах усяго Ізраіля: «Будзь цьвёрды і мужны, бо
ты ўвядзеш народ гэты ў зямлю, якую запрысяг ГОСПАД бацькам іхнім даць яе, і ты яе аддасі
ў спадчыну ім.
8 А ГОСПАД, Які ідзе перад абліччам тваім, Ён Сам будзе з табою, не пакіне цябе і не адступіцца
ад цябе. Ня бойся і не трывожся».
9 І напісаў Майсей Закон гэты, і перадаў яго сьвятарам, сынам Левія, якія насілі Каўчэг
Запавету ГОСПАДА, і ўсім старшыням Ізраіля.
10 І загадаў ім Майсей, кажучы: “Калі пройдзе сем гадоў, у год дараваньня [даўгоў], у сьвята
Намётаў,
11 калі ўвесь Ізраіль прыйдзе, каб зьявіцца перад абліччам ГОСПАДА, Бога твайго, у месцы,
якое Ён выбраў, перачытаеш словы Закону гэтага ўголас перад усім Ізраілем у вушы іхнія.
12 Зьбяры народ, мужчынаў і жанчынаў, дзяцей і прыхадняў тваіх, якія ў брамах тваіх, каб яны
пачулі і навучыліся баяцца ГОСПАДА, Бога вашага, і захоўвалі, і выконвалі ўсе словы Закону
гэтага.

13 А сыны іхнія, якія яшчэ ня ведаюць [гэтага], няхай слухаюць і вучацца баяцца ГОСПАДА, Бога
вашага, усе дні, як доўга будзеце жыць на зямлі, якую вы, перайшоўшы Ярдан, ідзіцё атрымаць
на ўласнасьць».
14 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вось, набліжаецца дзень сьмерці тваёй. Пакліч Егошуа і станьце
ў Намёце Спатканьня, і Я дам яму загады». І пайшлі Майсей і Егошуа, і сталі ў Намёце
Спатканьня.
15 І ГОСПАД зьявіўся ў Намёце ў слупе воблачным, і стаяў слуп воблачны каля ўваходу ў Намёт.
16 І сказаў ГОСПАД Майсею: «Вось, ты засьнеш з бацькамі тваімі, а народ гэты паўстане, і
будзе чужаложыць з багамі чужымі зямлі гэтай, у якую ўвойдзе; і пакіне ён Мяне, і парушыць
запавет Мой, які Я заключыў з ім.
17 І ўзгарыцца гнеў Мой супраць яго ў той дзень, і Я пакіну іх, і схаваю аблічча Маё ад іх, і будзе
ён на загубу. І прыйдуць на яго шматлікія нягоды і ўціскі, і ён скажа ў той дзень: “Ці ж не за
тое, што няма Бога са мной, нахлынулі гэтыя нягоды на мяне”.
18 І Я, хаваючы, схаваю аблічча Маё ў той дзень з прычыны ўсёй ліхоты, якую ён учыніў, бо ён
павярнуўся да багоў чужых.
19 І цяпер запішыце сабе гэты сьпеў. Навучы яму сыноў Ізраіля, укладзі яго ў вусны іхнія, каб
гэты сьпеў быў для Мяне сьведкам супраць сыноў Ізраіля.
20 Бо Я ўвяду яго ў зямлю, якую запрысяг Я бацькам ягоным, якая ацякае малаком і мёдам.
І будзе ён есьці, і насыціцца, і ў сытасьці павернецца да багоў чужых, і будзе служыць ім, а
Мною пагардзіць і разарве запавет Мой.
21 І станецца, калі дакрануцца яго шматлікія нягоды і ўціскі, сьпеў гэты будзе сьведкам перад
абліччам ягоным, бо вусны нашчадкаў ягоных не забудуцца яго. Бо Я ведаю намеры ягоныя,
паводле якіх ён робіць сёньня, перш, чым увяду яго ў зямлю, якую абяцаў [яму]».
22 І запісаў Майсей сьпеў гэты ў той дзень, і навучыў яму сыноў Ізраіля.
23 І загадаў ГОСПАД Егошуа, сыну Нуна, і сказаў: «Будзь цьвёрды і мужны, бо ты ўвядзеш сыноў
Ізраіля ў зямлю, якую Я абяцаў ім, і Я буду з табою».
24 І сталася, калі Майсей скончыў пісаць словы Закону гэтага ў кнізе,
25 загадаў Майсей лявітам, якія насілі Каўчэг Запавету ГОСПАДА, кажучы:
26 «Вазьміце кнігу Закону гэтага і палажыце яе побач Каўчэгу Запавету ГОСПАДА, Бога вашага,
і будзе яна сьведкам супраць цябе.
27 Бо я ведаю непаслухмянасьць тваю і цьвёрды карак твой. Вось, сёньня, калі я жыву з вамі,
вы былі непаслухмяныя ГОСПАДУ. А што будзе пасьля сьмерці маёй?
28 Зьбярыце да мяне ўсіх старшыняў каленаў вашых, і начальнікаў вашых, і я прамоўлю ў вушы
іхнія словы гэтыя і паклічу супраць іх неба і зямлю на сьведкаў.
29 Бо я ведаю, што пасьля сьмерці маёй вы будзеце сапсаваныя і зьвернеце са шляху, які я
вам загадаў, і напаткаюць вас у апошнія дні няшчасьці, бо вы будзеце рабіць ліхоту ў вачах
ГОСПАДА і разгневаеце Яго справамі рук вашых».
30 І прамовіў Майсей у вушы ўсёй царквы Ізраіля словы сьпеву гэтага аж да канца:

Друг 32

1 «Прыхіліце вушы, нябёсы, і я прамоўлю! І няхай чуе зямля словы вуснаў маіх!
2 Няхай кроплямі падае, як дождж, вучэньне маё, няхай сьцякае, як раса, мова мая, як імжа
на зеляніну, як залева на траву.
3 Бо я буду клікаць імя ГОСПАДА! Давайце ўзьвялічым Бога нашага!
4 [Ён] — Скала, і дасканалыя творы Яго, бо ўсе шляхі Ягоныя справядлівыя. Бог верны, і няма
ў Ім хлусьні, Ён — праведны і справядлівы.
5 Яны сапсаваліся, яны ня ёсьць сынамі Ягонымі з прычыны заганў сваіх, пакаленьне
падступнае і крывадушнае.
6 Ці ж так адплачваеце вы ГОСПАДУ, народзе бязглузды і бяз мудрасьці? Ці ж ня Ён —Бацька
твой? Ён набыў цябе і ўчыніў, і ўмацаваў.

7 Памятай пра дні старадаўнія, разважай пра гады пакаленьняў [мінулых]; спытайся бацьку
твайго, і ён паведаміць табе, [спытайся] старшыняў тваіх, і яны раскажуць табе.
8 Калі Найвышэйшы даваў спадчыну народам, калі разьдзяляў сыноў чалавечых, Ён вызначыў
межы народам паводле ліку сыноў Ізраіля.
9 Уласнасьць ГОСПАДА — народ Ягоны. Якуб — абшар спадчыны Ягонай.
10 Ён знайшоў яго ў зямлі пустыннай, у [зямлі] пустой і бязьлюднай, дзе выюць [шакалы]. Ён
асланяў яго, даглядаў яго і захоўваў яго, як зрэнку вока Свайго.
11 Як арол узрушвае гняздо сваё і кружляе над птушанятамі сваімі, раскінуўшы крылы свае,
бярэ іх і нясе на крылах сваіх,
12 так ГОСПАД Сам вёў яго, і не было з ім бога чужога.
13 І Ён паставіў яго на высокай зямлі, каб ён спажываў плады палёў, і Ён карміў яго мёдам са
скалы і алеем з цьвёрдага камяня,
14 маслам кароваў і малаком авечак, тлушчам ягнятаў, і бараноў Башану, і казлоў, і тлушчам
нырак, і найчысьцейшай пшаніцай, і ён піў кроў вінаграду.
15 Насыціўся Ешурун і стаўся брыклівы, стаў сыты, тлусты і гладкі, і пакінуў Бога, Які ўчыніў
яго, і зьняважыў Скалу збаўленьня свайго.
16 І яны ўзбудзілі рэўнасьць Ягоную [багамі] чужымі, і брыдотамі раззлавалі Яго.
17 Яны складалі ахвяры дэманам, а ня Богу, [пакланяліся] багам, якіх ня ведалі, [багам] новым,
якія нядаўна зьявіліся, якім не пакланяліся бацькі іхнія.
18 Скалу, Якая цябе нарадзіла, ты пакінуў, ня памятаў Бога, Які вывеў на сьвет цябе.
19 І ўбачыў [гэта] ГОСПАД, і ўзьненавідзеў [іх], і загневаўся на сыноў Сваіх і дочак Сваіх.
20 І сказаў Ён: “Схаваю аблічча Маё ад іх і пабачу, які [будзе] канец іхні, бо гэта пакаленьне
падступнае, сыны няверныя.
21 Яны ўзбудзілі рэўнасьць Маю тым, што ня [ёсьць] богам, марнасьцямі сваімі раздражнілі
Мяне; і Я ўзбуджу рэўнасьць іхнюю тым, што ня [ёсьць] народам, народам дурным раздражню
іх.
22 Узгарэўся агонь ярасьці Маёй і будзе гарэць аж да найглыбейшай адхлані, і спаліць зямлю і
ўраджай ейны, і спапяліць падваліны гор.
23 Я зьбяру на іх няшчасьці, [пушчу] ў іх стрэлы Мае.
24 Будзе іх марыць голад, паліць трасца і пошасьць лютая, і Я пашлю на іх зубы зьвяроў і атруту
тых, што поўзаюць у пыле.
25 На двары будзе нішчыць іх меч, а ў дамах — жах, юнака разам з дзяўчынаю, немаўля разам
з чалавекам сівым.
26 Я сказаў: "Вынішчу іх і спыню ў людзей памяць пра іх".
27 Але Я [спыніў гэта] з прычыны зьнявагаў ворагаў, каб прыгнятальнікі іхнія не вывышаліся
і не казалі: "Рука нашая ўзьнятая, а ня ГОСПАД зрабіў усё гэта!"
28 Бо гэта народ бязрадны, і няма ў іх розуму.
29 Калі б яны былі мудрымі, яны б зразумелі гэта і разважалі б пра канец свой!
30 Ці мог бы адзін гнаць тысячу, а дваіх выгнаць дзесяць тысячаў, калі б Скала іхняя не прадала
іх [у няволю] і калі б ГОСПАД не пакінуў іх?
31 Бо скала іхняя не такая, як Скала нашая; але ворагі нашыя [будуць] судзьдзямі.
32 Бо вінаград іхні — з вінаграднай лазы Садомскай і з палёў Гаморскіх. Ягады іхнія атрутныя,
а гронкі [горкія], як палын.
33 Віно іхняе — атрута цмочая і сьмяротная труцізна гадзючая.
34 Ці ж гэта не схавана ў-ва Мне і не запячатана ў скарбніцах Маіх?
35 Мне [належыць] помста і Я аднагароджу ў час, калі пахісьнецца нага іхняя! Бо блізка ўжо
дзень загубы іхняй і надыходзіць рашэньне [лёсу] іхняга.
36 І будзе судзіць ГОСПАД народ Свой, і пашкадуе Ён слугаў Сваіх, калі ўбачыць, што рука іхняя
аслабела і што няма ані нявольнікаў, ані вольных.
37 І скажа Ён: “Дзе ж богі іхнія, дзе скала, на якую яны мелі надзею,

38 што елі тлустасьць ахвяраў іхніх, і пілі віно іхніх ахвяраў вадкіх? Няхай устануць і
дапамогуць вам, і няхай у бядзе абароняць вас!
39 Паглядзіце цяпер, што Я, Я ёсьць, і няма Бога апрача Мяне, Я забіваю і Я даю жыць, Я калечу
і Я аздараўляю, і няма такога, хто можа вырвацца з рукі Маёй.
40 Я падыму да неба руку Маю і скажу: "Жыву вечна!"
41 Калі Я вывастру меч Мой бліскучы і рука Мая выканае прысуд, Я адпомшчу ворагам Маім, і
тым, якія ненавідзяць Мяне, Я аднагароджу.
42 Я напаю крывёю стрэлы Мае, і меч Мой насыціцца мясам, крывёй забітых і палонных,
галовамі варожых правадыроў!”
43 Весяліцеся, народы, з народам Ягоным, бо Ён адпомсьціць за кроў слугаў Сваіх і ўчыніць
помсту ворагам Сваім, і міласьцівы будзе да зямлі народу Свайго».
44 І пайшоў Майсей з Егошуа, сынам Нуна, і прамовіў усе словы сьпеву гэтага ў вушы народу.
45 І скончыў Майсей прамаўляць усе словы гэтыя да ўсяго Ізраіля,
46 і сказаў ім: «Зьмясьціце ў сэрцы вашым усе словы, якімі я сёньня папярэджваю вас, і
загадайце сынам вашым захоўваць іх, і выконваць усе словы Закону гэтага.
47 Бо слова гэтае не пустое для вас, але гэта жыцьцё вашае; і праз слова гэтае будуць доўгія дні
[вашыя] на зямлі, у якую вы пераходзіце праз Ярдан, каб авалодаць ёю».
48 І ў той самы дзень прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы:
49 «Узыйдзі на гэтую гару Абарым, на гару Нэво, якая ў зямлі Мааў насупраць Ерыхону, і
паглядзі на зямлю Ханаан, якую Я даю сынам Ізраіля на ўласнасьць.
50 А ты памрэш на гары, на якую ты ўзыйдзеш, і далучышся да народу свайго, як памёр Аарон,
брат твой, на гары Гор і далучыўся да народу свайго.
51 За тое, што вы дапусьціліся злачынства адносна Мяне між сынамі Ізраіля пры водах Мэрывы
каля Кадэшу, у пустыні Сін, за тое, што вы ня выявілі сьвятасьць Маю сярод сыноў Ізраіля,
52 за гэта [толькі] здалёк убачыш тую зямлю, але ты сам ня ўвойдзеш туды, у зямлю, якую Я
даю сынам Ізраіля».

Друг 33

1 Гэта дабраславенства, якім дабраславіў Майсей, чалавек Божы, сыноў Ізраіля перад сьмерцю
сваёй.
2 І ён сказаў: «ГОСПАД прыйшоў з Сынаю і з Сэіру зыйшоў да іх; зьявіўся з гары Паран і
прыйшоў з дзясяткамі тысячаў сьвятых, з правіцы Ягонай агонь палае.
3 Сапраўды Ён любіць народы. Усе сьвятыя Твае ў руцэ Тваёй, і яны туляцца да ног Тваіх,
слухаюць словы Твае.
4 Закон даў нам Майсей, спадчыну збору Якуба.
5 І быў [выбраны] ў Ешуруна валадар на сходзе князёў народу разам з каленамі Ізраіля.
6 Няхай жыве Рубэн і няхай не памірае, і няхай будзе [нейкі] лік сьмяротных [людзей]
ягоных».
7 Гэта ён сказаў да Юды: «Выслухай, ГОСПАДЗЕ, голас Юды і прывядзі яго да народу Свайго.
Рукою Тваёю ваюй за яго і дапамажы яму супраць прыгнятальнікаў ягоных».
8 Да Левія сказаў: “Тумім Твой і урым Твой дай чалавеку сьвятому Твайму, якога Ты
выпрабаваў у Масе і з якім спрачаўся ля водаў Мэрывы.
9 Ён пра бацьку свайго і маці сваю сказаў: "Ня ведаю вас". І не пазнаў братоў сваіх, і сыноў
сваіх ня ведае, бо яны захоўваюць загады Твае і запавет Твой пільнуюць.
10 Яны вучаць Якуба пастановам Тваім і [навучаюць] Ізраіля Закону Твайму; і паляць кадзіла
ў ноздры Твае, і цэласпаленьні — на ахвярніку Тваім.
11 Дабраславі, ГОСПАДЗЕ, моц ягоную і прымі працу рук ягоных. Стаўчы сьцёгны тых, якія
паўстаюць на яго, і тыя, што зьненавідзелі яго, няхай не падымуцца».
12 Да Бэн’яміна сказаў: «Улюбёны ГОСПАДАМ будзе жыць у бясьпецы пры Ім. Ён будзе
засланяць яго ўсе дні, і супачыне ён у рамёнах Ягоных”.
13 Да Язэпа сказаў: “Дабраслаўлёная ГОСПАДАМ зямля ягоная дарамі неба, расою, крыніцамі
бездані падземнай,

14 дарамі сонца і пладамі месяца,
15 багацьцем гор спрадвечных і пладамі ўзгоркаў адвечных,
16 пладамі зямлі і поўняй яе. Ласка Таго, Хто аб'явіўся ў кусьце, няхай зыйдзе на галаву Язэпа
і на цемя пасьвячонага сярод братоў сваіх.
17 Прыгажосьць ягоная — як першароднага быка, і рогі ягоныя — як рогі аднарога, імі ён збадае
народы аж да канца зямлі. Такія дзясяткі тысячаў Эфраіма, і такія тысячы Манасы».
18 І да Завулёна сказаў: "Радуйся, Завулён, у выхадзе тваім, а ты, Ісахар, у намётах тваіх!
19 Паклічуць народы на гару, там будуць складаць ахвяры праведнасьці. Яны будуць
карыстацца шчодрасьцю мора і багацьцямі, схаванымі ў пяску».
20 Да Гада сказаў: «Дабраслаўлёны той, хто пашырае Гада! Як леў будзе ён жыць, ён разарве
рамяно і цемя.
21 І ён убачыць пяршыны свае, бо там памешчана частка правадыра, і ён выходзіў на чале
народу, і рабіў праведнае перад ГОСПАДАМ, і [чыніў] прысуды Ягоныя адносна Ізраіля».
22 Да Дана сказаў: «Дан — ільвянятка, якое выскоквае з Башану».
23 Да Нэфталі сказаў: «Нэфталі перапоўнены ласкаю і поўны дабраславенства ГОСПАДА; ён
заваладае морам і поўднем».
24 Да Асэра сказаў: «Дабраслаўлёны Асэр між сынамі! Няхай ён будзе даспадобы братам сваім
і няхай будзе мачыць у алеі нагу сваю.
25 З жалеза і медзі засаўкі твае, як дні твае, [трывае] сіла твая».
26 «Няма такога, як Бог Ешуруна, Які ідзе па небе на дапамогу табе і ў велічнасьці Сваёй [ідзе]
па воблаках.
27 Прыбежышча тваё — Бог спрадвечны, абарона твая — рамёны вечныя. Ён выганіць перад
абліччам тваім ворага і скажа: "Зьнішчы".
28 Ізраіль будзе жыць у бясьпецы, вочы Якуба бачаць перад сабою зямлю збожжа і віна, і з
нябёсаў ягоных кроплямі падае раса.
29 Шчасьлівы ты, Ізраіль! Хто [падобны] да цябе, народ, якога збавіў ГОСПАД. Ён — шчыт
абароны тваёй і меч велічнасьці тваёй. Ворагі твае скараюцца перад абліччам тваім, і ты
будзеш таптаць каркі іхнія».

Друг 34

1 І ўзыйшоў Майсей з раўніны Мааву на гару Нэво, на вяршыню Пісга насупраць Ерыхону. І
паказаў яму ГОСПАД усю зямлю Гілеад аж да Дану,
2 і ўсю [зямлю] Нэфталі, зямлю Эфраіма і Манасы, і ўсю зямлю Юды аж да Мора Заходняга,
3 Нэгеў і абшар раўніны Ерыхону, гораду пальмаў, аж да Цаару.
4 І сказаў ГОСПАД яму: «Гэта тая зямля, якую Я запрысяг Абрагаму, Ісааку і Якубу, кажучы: "Я
дам яе насеньню твайму". Бачыў ты яе вачыма сваімі, але ня ўвойдзеш у яе».
5 І памёр Майсей, слуга Божы, там, у зямлі Мааў, паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА.
6 І пахавалі яго ў даліне ў зямлі Мааў насупраць Бэт-Пэору. І ніхто ня ведае магілы ягонай па
сёньняшні дзень.
7 Майсей меў сто дваццаць гадоў, калі памёр, але вочы ягоныя не былі прыцьмёныя, і сіла
ягоная не пакінула яго.
8 І плакалі па Майсеі сыны Ізраіля на раўніне Мааву трыццаць дзён. І скончыліся дні жалобы
па Майсеі.
9 І Егошуа, сын Нуна, на якога Майсей усклаў рукі свае, быў поўны духа мудрасьці. І слухалі
яго сыны Ізраіля, і рабілі ўсё, як загадаў ГОСПАД праз Майсея.
10 І не паўстаў больш у Ізраілі прарок такі, як Майсей, якога ведаў ГОСПАД тварам у твар
11 і якога паслаў чыніць знакі і цуды ў зямлі Эгіпецкай перад фараонам, і перад слугамі
ягонымі, і перад усёй зямлёй ягонай,
12 і рабіць усе [дзеяньні] рукі моцнай і ўсе [дзеяньні] страшныя, якія ўчыніў Майсей на вачах
усяго Ізраіля.

КНІГА ЕГОШУА

1 Пасьля сьмерці Майсея, слугі ГОСПАДА, сказаў ГОСПАД да Егошуа, сына Нуна, памочніка
Майсея.
2 «Майсей, слуга Мой, памёр. Дык цяпер ты ўстань і перайдзі праз гэты вось Ярдан, ты і ўвесь
народ гэты, у зямлю, якую Я даю сынам Ізраіля.
3 Кожнае месца, на якое ступіць нага вашая, Я даю вам, як Я сказаў Майсею.
4 Ад пустыні і ад Лібану гэтага аж да ракі вялікай, ракі Эўфрат, уся зямля Хетаў, і аж да Вялікага
Мора на захад сонца будзе мяжа вашая.
5 Ніхто ня зможа супрацівіцца табе ў-ва ўсе дні жыцьця твайго, і як Я быў з Майсеем, так буду
з табою. Не пакіну цябе і не адступлю ад цябе.
6 Будзь цьвёрды і мужны, бо ты гэтаму народу жэрабям разьдзеліш зямлю, якую Я запрысяг
бацькам іхнім, што дам ім.
7 Толькі будзь цьвёрды і вельмі мужны, каб старанна выконваў увесь Закон, які пераказаў табе
Майсей, слуга Мой. Не адступішся ад яго ані ўправа, ані ўлева, каб меў посьпех у-ва ўсім, да
чаго будзеш імкнуцца.
8 Няхай не адыйдзе гэтая кніга Закону ад вуснаў тваіх, але будзеш разважаць над ёй удзень і
ўначы, каб старанна выканаць усё, што напісана ў ёй. Тады будуць шчасьлівыя шляхі твае і
будзеш мець посьпех.
9 Вось, Я загадваю табе: “Будзь цьвёрды і мужны, не палохайся і ня бойся, бо з табою ГОСПАД,
Бог твой, усюды, куды ні пойдзеш”».
10 Загадаў тады Егошуа начальнікам народу: «Прайдзіце праз табар і загадайце народу,
кажучы:
11 “Прыгатуйце сабе ежу, бо праз тры дні вы пяройдзеце праз гэты Ярдан, каб заваладаць
зямлёю, якую ГОСПАД, Бог ваш, дае вам на ўласнасьць”».
12 А [сынам] Рубэна і Гада, і палове калена Манасы сказаў:
13 «Узгадайце, што вам загадаў Майсей, слуга ГОСПАДА, кажучы: “ГОСПАД, Бог ваш, даў вам
супакой і зямлю гэтую.
14 Жонкі вашыя, і дзеці вашыя, і жывёла вашая будуць у зямлі, якую даў вам Майсей за
Ярданам, а вы пяройдзеце са зброяй перад братамі вашымі, усе мужныя ваяры, і будзеце
дапамагаць ім,
15 аж пакуль дасьць ГОСПАД супакой братам вашым, як і вам даў, каб яны таксама валодалі
зямлёй, якую ГОСПАД, Бог ваш, мае даць ім. А потым вернецеся ў зямлю пражываньня вашага,
якую даў вам Майсей, слуга ГОСПАДА, за Ярданам на ўсход сонца, і будзеце жыць у ёй”».
16 І яны адказалі Егошуа, кажучы: «Усё, што ты загадаў нам, зробім, і куды пашлеш, пойдзем.
17 Як слухалі мы ў-ва ўсім Майсея, так будзем слухаць цябе. Толькі няхай будзе ГОСПАД, Бог
твой, з табою, як быў з Майсеем.
18 Хто будзе пярэчыць вуснам тваім і ня слухацца словаў тваіх, што загадаеш, няхай будзе
пакараны сьмерцю. Ты толькі будзь цьвёрды і мужны».

Ег 2

1 Егошуа, сын Нуна, з Шыттыму паслаў патаемна двух выведчыкаў і сказаў ім: «Ідзіце і
аглядайце зямлю і горад Ерыхон». І яны пайшлі, і ўвайшлі ў дом распусьніцы імем Рахаў, і
там затрымаліся.
2 Паведамілі пра гэта валадару Ерыхонскаму і сказалі: «Гэтыя людзі прыйшлі сюды ўначы ад
сыноў Ізраіля, каб выведаць зямлю».
3 І валадар Ерыхонскі паслаў да Рахаў людзей, загадваючы: «Вывядзі тых людзей, якія прыйшлі
да цябе і ўвайшлі ў дом твой. Яны — выведчыкі і прыйшлі выведаць усю гэтую зямлю».
4 Але жанчына ўзяла і схавала мужоў тых, і сказала: «Прызнаюся, прыйшлі да мяне людзі тыя,
але я ня ведала, адкуль яны.

5 Калі ў поцемках зачынялася брама, яны разам выйшлі, і я ня ведаю, куды яны пайшлі. Бяжыце хутка за імі і зловіце іх».
6 Сама ж яна завяла іх на дах дому свайго і закрыла іх снапамі лёну, якія там былі.
7 Тыя ж людзі [валадара] пабеглі дарогаю, якая ідзе да бродаў на Ярдане. Пасьля іх адыходу брама была адразу зачынена.
8 Яшчэ не заснулі тыя, што хаваліся, як Рахаў прыйшла да іх і сказала:
9 «Я ведаю, што ГОСПАД аддаў вам зямлю гэтую, і жах перад вамі ахапіў нас, і ўсе жыхары зямлі памлелі перад вамі.
10 Чулі мы, што ГОСПАД асушыў перад вамі воды Мора Чырвонага, калі выйшлі вы з Эгіпту і што вы зрабілі двум валадарам Амарэйскім, якія жылі за Ярданам, Сыгону і Огу, якіх вы забілі.
11 Усё вось гэта чуючы, мы баімся, і млее ў нас сэрца нашае, і займае дух нам дзеля надыходу вашага. Бо ГОСПАД, Бог ваш, Ён — Бог у небе высока і на зямлі нізка.
12 І цяпер прысягніце мне на ГОСПАДА, што як я вам зьявіла міласэрнасьць, так і вы зробіце ласку сям'і бацькі майго і дасьцё мне знак як заруку,
13 што захаваеце бацьку майго і маці маю, братоў маіх і сёстраў маіх і ўсё, што іхняе, і ўратуеце душы нашыя ад сьмерці».
14 Яны адказалі ёй: «Мы за вас гатовыя памерці, калі толькі нас ня выдасі. Калі ГОСПАД аддасьць нам зямлю гэтую, мы зьявім табе міласэрнасьць і вернасьць».
15 І спусьціла яна іх на вяроўцы з акна, бо дом яе прылягаў да муру гарадзкога і яна нібыта ў мурах жыла.
16 І сказала яна ім: «Ідзіце ў горы, каб часам не сустрэлі вас тыя, што шукаюць вас. Там перахаваецеся тры дні, пакуль яны вернуцца, і тады пойдзеце шляхам сваім».
17 Выведчыкі сказалі ёй: «Мы будзем чыстыя ад прысягі гэтай, якою запрысягла ты нас, калі ты ня зробіш гэтак:
18 Калі мы ўвойдзем у зямлю гэтую, ты прывяжы вяроўку з пурпуровых нітак да вакна, праз якое спусьціла нас. І забяры ў дом свой бацьку твайго, маці тваю, братоў тваіх і ўсю радню тваю.
19 Калі хто выйдзе з дзьвярэй дому твайго, кроў ягоная спадзе на галаву ягоную, а мы будзем невінаватыя. А калі хто ў доме з табой будзе заставацца, кроў ягоная спадзе на галаву нашую, калі нечая рука іх дакранецца.
20 Калі ж нашую справу ты выявіш, мы будзем свабодныя ад прысягі, якою ты нас зьвязала».
21 На гэта яна адказала: «Як вы сказалі, няхай так будзе». І адпусьціла іх у дарогу, і яны пайшлі, а яна павесіла пурпуровую вяроўку ў вакне.
22 Выведчыкі пайшлі, і прыйшлі ў горы, і там былі тры дні, аж пакуль не вярнуліся людзі, пасланыя на пошукі іх. Тыя ж шукалі па ўсёй дарозе і не знайшлі іх.
23 Тады вярнуліся і два выведчыкі. Яны зыйшлі з гары, пераправіліся праз раку, а калі прыйшлі да Егошуа, сына Нуна, расказалі яму ўсё, што іх спаткала.
24 І дадалі: «Аддаў ГОСПАД у рукі нашыя ўсю зямлю гэтую, і ўсе жыхары яе млеюць у страху перад намі».

Ег 3

1 І вось Егошуа, рана раніцай устаўшы, падняў табар. Выйшаўшы з Шыттыму, прыйшлі яны да Ярдану, ён і ўсе сыны Ізраіля, і затрымаліся там перад пераправай.
2 Праз тры дні прайшлі начальнікі праз табар
3 і далі загад народу: «Калі ўбачыце Каўчэг Запавету ГОСПАДА, Бога вашага, і сьвятароў з роду Левія, якія нясуць яго, вы, устаўшы, ідзіце за ім.
4 Няхай паміж вамі і Каўчэгам будзе прастора каля двух тысячаў локцяў, і не набліжайцеся да яго, каб вы ведалі, якім шляхам ісьці, бо раней вы гэтым шляхам не хадзілі».
5 І сказаў Егошуа народу: «Асьвяціцеся! Бо заўтра выявіць ГОСПАД пасярод вас цуды».
6 І сказаў сьвятарам: «Вазьміце Каўчэг Запавету і ідзіце перад народам». Яны ўзялі і пайшлі перад народам.

7 І сказаў ГОСПАД да Егошуа: «Сёньня Я пачну ўзвышаць цябе перад усім Ізраілем, каб ведалі
яны, што як Я быў з Майсеем, так буду з табой.
8 Ты ж загадай сьвятарам, якія нясуць Каўчэг Запавету і скажы ім: “Калі прыйдзеце на бераг
Ярдану, станеце ў Ярдане!”»
9 І сказаў Егошуа сынам Ізраіля: «Падыйдзіце сюды і паслухайце словы ГОСПАДА, Бога
вашага».
10 І зноў казаў Егошуа: «З гэтага вы пазнаеце, што Бог жывы пасярод вас і што, праганяючы,
Ён прагоніць Хананейцаў, Хетаў, Хівеяў, Пэрэзэяў, Гіргашэяў, Амарэйцаў і Евусэяў.
11 Вось, Каўчэг Запавету Госпада ўсёй зямлі пяройдзе перад вамі праз Ярдан.
12 І вазьміце дванаццаць мужчынаў з каленаў Ізраіля, па адным з кожнага калена.
13 Як толькі стопы ног сьвятароў, што нясуць Каўчэг ГОСПАДА, Госпада ўсёй зямлі, будуць у
водах Ярдану, воды разьдзеляцца, і тыя, што цякуць з гор, стануць сьцяною».
14 І калі народ вырушыў з намётаў сваіх, каб пераправіцца праз Ярдан, сьвятары, якія несьлі
Каўчэг Запавету, ішлі перад народам.
15 І заледзь прыйшлі яны да Ярдану, і ногі сьвятароў, якія несьлі Каўчэг, уступілі ў ваду, — а
Ярдан у пару жніва падымаецца аж да берагоў, —
16 вада, што цякла зьверху, затрымалася і стала сьцяной на вялікім прасторы ад гораду Адама,
які побач з Цартанам, а тая, што цякла ў мора Арабы, значыць у Мора Салёнае, сьцякала, аж
зусім счэзла.
17 І народ пераходзіў каля Ерыхону, а сьвятары, якія несьлі Каўчэг Запавету ГОСПАДА, стаялі
на сухой зямлі пасярод Ярдану цьвёрдаю нагою, аж пакуль увесь народ пераходзіў праз Ярдан.

Ег 4

1 Калі ўвесь народ пераправіўся праз Ярдан, сказаў ГОСПАД да Егошуа:
2 «Вазьміце дванаццаць мужчынаў спасярод народу, па адным з кожнага калена,
3 і загадайце, каб узялі з сярэдзіны Ярдану, дзе моцна стаялі ногі сьвятароў, дванаццаць
камянёў, якія панесіцё з сабою і паложыце ў месцы, дзе разложыцеся табарам пераначаваць».
4 Тады Егошуа паклікаў дванаццаць мужчынаў, якіх выбраў з сыноў Ізраіля, па адным з
кожнага калена.
5 І сказаў ім Егошуа: «Ідзіце перад Каўчэгам ГОСПАДА, Бога вашага, на сярэдзіну Ярдану, і
няхай кожны прынясе на плячах сваіх па адным камяні паводле лічбы каленаў сыноў Ізраіля.
6 Няхай гэта будзе знакам для вас. А калі сыны вашыя ў будучыні спытаюцца ў вас: “Што
значаць гэтыя камяні?” —
7 вы адкажаце: “Гэта памятка таго, што воды Ярдану разьдзяліліся перад Каўчэгам Запавету
ГОСПАДА, калі ён перапраўляўся праз яго. Дзеля гэтага паложаны камяні гэтыя як памятка
сынам Ізраіля на вякі”».
8 І сыны Ізраіля зрабілі так, як загадаў ім Егошуа, і прынесьлі з сярэдзіны Ярдану дванаццаць
камянёў, як ГОСПАД загадаў Егошуа, паводле каленаў сыноў Ізраіля, і прынесьлі ў месца, дзе
былі разлажыўшыся табарам. Там іх палажылі.
9 Таксама іншых дванаццаць камянёў палажыў Егошуа на сярэдзіне Ярдану, дзе стаялі
сьвятары, якія несьлі Каўчэг Запавету. Яны там знаходзяцца да сёньняшняга дня.
10 Сьвятары, якія несьлі Каўчэг, стаялі на сярэдзіне Ярдану, аж пакуль не было выканана ўсё,
што ГОСПАД загадаў Егошуа абвясьціць народу, згодна з тым, што загадаў Майсей Егошуа.
Народ жа пасьпешліва перапраўляўся.
11 Калі ўжо ўсе пераправіліся, тады перайшоў і Каўчэг ГОСПАДА, перайшлі і сьвятары, і сталі
наперадзе народу.
12 А сыны Рубэна, і сыны Гада, і палова калена Манасы перайшлі ўзброеныя наперадзе сыноў
Ізраіля, як ім загадаў Майсей.
13 Каля сарака тысячаў ваяроў узброеных перайшло перад абліччам ГОСПАДА на раўніны
Ерыхонскія, каб ваяваць.
14 У той дзень узьвялічыў ГОСПАД Егошуа перад усім Ізраілем, і сталі баяцца яго, як баяліся
Майсея ў-ва ўсе дні жыцьця ягонага.

15 І сказаў ГОСПАД да Егошуа:
16 «Загадай сьвятарам, якія несьлі Каўчэг Запавету, каб выйшлі з Ярдану!»
17 І загадаў Егошуа сьвятарам: «Выйдзіце з Ярдану».
18 Калі яны выйшлі, несучы Каўчэг Запавету ГОСПАДА, і пачалі ісьці па сухой зямлі, вярнуліся воды на месца сваё і цяклі як раней у сваіх берагах.
19 У дзясяты дзень першага месяцу народ выйшаў з Ярдану і разлажыўся табарам у Гільгале, на ўсход ад Ерыхону.
20 Тых жа дванаццаць камянёў, якія былі ўзятыя з Ярдану, Егошуа паставіў у Гільгале,
21 і сказаў сынам Ізраіля: «Калі спытаюцца сыны вашыя ў будучыні бацькоў сваіх: “Што азначаюць гэтыя камяні?” —
22 скажыце сынам вашым: “Па сухім дне перайшоў Ізраіль гэтую раку Ярдан,
23 бо ГОСПАД, Бог ваш, высушыў ваду Ярдану на вачах вашых, пакуль вы не перайшлі, як раней учыніў з Морам Чырвоным, якое высушыў перад намі, пакуль мы праз яго не перайшлі,
24 каб усе народы на зямлі пазналі магутную руку ГОСПАДА, і каб вы ў-ва ўсе дні баяліся ГОСПАДА, Бога вашага”».

Ег 5

1 Калі ўсе валадары Амарэйцаў, якія жылі за Ярданам на захад, і ўсе валадары Ханаану, якія жылі ўздоўж мора, пачулі, што ГОСПАД высушыў воды Ярдану перад сынамі Ізраіля, аж пакуль яны пераправіліся, дык аслабела ў іх сэрца і страцілі яны адвагу перад сынамі Ізраіля.
2 У той час сказаў ГОСПАД да Егошуа: «Зрабі сабе нажы каменныя і абрэж сыноў Ізраіля другі раз».
3 І зрабіў ён нажы каменныя, і абрэзаў сыноў Ізраіля на ўзгорку Аралёт.
4 Такая вось прычына другога абразаньня: увесь народ, які выйшаў з Эгіпту, мужчынскага роду, усе ваяры памерлі, вандруючы па пустыні,
5 а яны ўсе былі абрэзаны. Народ жа, які нарадзіўся ў пустыні, ня быў абрэзаны.
6 Сорак гадоў блукалі сыны Ізраіля па пустыні, пакуль не загінулі ўсе ваяры, людзі, якія выйшлі з Эгіпту, якія не паслухаліся голасу ГОСПАДА і якім Ён запрысяг, што не пакажа ім зямлю, якая ацякае малаком і мёдам.
7 Сыны іхнія, якія сталі на месца бацькоў, былі абрэзаны Егошуам, бо яны пасьля нараджэньня свайго не былі абрэзаны, і ніхто іх у дарозе не абразаў.
8 Калі ўжо ўсе былі абрэзаны, заставаліся ў тым самым месцы табарам, пакуль не паздаравелі.
9 І сказаў ГОСПАД да Егошуа: «Сёньня зьняў Я з вас ганьбу Эгіпецкую». І названае імя месца гэтага Гільгал да сёньняшняга дня.
10 І стаялі табарам сыны Ізраіля ў Гільгале, і ў чатырнаццаты дзень месяца сьвяткавалі Пасху вечарам на раўнінах Ерыхонскіх.
11 А на другі дзень Пасхі елі плады той зямлі, праснакі і зерне пражанае.
12 Манна спынілася ад другога дня, калі пачалі есьці плады той зямлі. І ня елі ўжо манны сыны Ізраіля, а харчаваліся ў той год пладамі зямлі Ханаан.
13 Калі Егошуа быў на полі каля гораду Ерыхону, ён узьняў вочы і ўбачыў, і вось, муж стаіць насупраць яго і меч аголены ў руцэ ягонай. І падыйшоў Егошуа да яго, і спытаўся: «Ці ты на нашым [баку], ці на баку ворагаў нашых?»
14 Ён адказаў: «Не. Я — князь войска ГОСПАДА, і вось Я прыйшоў». І Егошуа ўпаў на аблічча сваё, і пакланіўся яму, і сказаў яму: «Што прамовіць Госпад мой да слугі Свайго?»
15 Князь войска ГОСПАДА сказаў Егошуа: «Здымі сандалы з ног тваіх, бо месца, на якім ты стаіш, — сьвятое». І Егошуа зрабіў так.

Ег 6

1 Ерыхон быў абкружаны мурам і замкнуўся перад сынамі Ізраіля. Ніхто не выходзіў з яго і ніхто не ўваходзіў.
2 І сказаў ГОСПАД да Егошуа: «Вось, Я аддаю ў рукі твае Ерыхон, валадара яго і ўсіх моцных ваяроў.

3 Усе вы, узброеныя ваяры, абыходзьце вакол гораду раз у дзень. Так рабіце шэсьць дзён.
4 Сем сьвятароў будзе несьці перад Каўчэгам сем трубаў з бараніх рагоў. У сёмы дзень абыйдзіце вакол гораду сем разоў, а сьвятары будуць трубіць у трубы.
5 І станецца, калі загудзіць працягла рог барані і вы пачуеце гук трубы, няхай увесь народ узвысіць гучны крык, і мур гораду разваліцца на месцы, і народ увойдзе, кожны [проста] перад сабою».
6 Егошуа, сын Нуна, паклікаў сьвятароў і сказаў ім: «Нясіце Каўчэг Запавету, а сем сьвятароў няхай нясуць сем трубаў з рагоў бараніх перад Каўчэгам ГОСПАДА».
7 А потым загадаў народу: «Ідзіце і абыходзьце горад, а ўзброеныя [ваяры] няхай ідуць перад Каўчэгам ГОСПАДА».
8 Як толькі Егошуа скончыў гаварыць, сем сьвятароў затрубілі ў сем трубаў з рагоў бараніх і пайшлі, а Каўчэг Запавету ГОСПАДА пайшоў за імі.
9 І ўсё ўзброенае войска ішло перад сьвятарамі, што трубілі, а рэшта войска ішла за Каўчэгам, і трубы штораз мацней трубілі.
10 А Егошуа загадаў людзям: «Не гаманіце, каб ня чуўся гоман ваш, і каб нават слова не выходзіла з вуснаў вашых, але калі настане дзень, у які скажу вам: “Крычыце”, тады будзеце крычаць».
11 І вось Каўчэг ГОСПАДА за дзень абыйшоў горад, і ўсе вярнуліся ў табар, і там пераначавалі.
12 І ўстаў Егошуа рана, і сьвятары ўзялі Каўчэг Запавету.
13 Сем з іх узялі сем трубаў з рагоў бараніх, і пайшлі перад Каўчэгам ГОСПАДА, ідучы і трубячы, а ўзброеныя дружыны ішлі перад імі, а рэшта войска ішла за Каўчэгам і, ідучы, трубілі.
14 І ў другі дзень абыйшлі горад адзін раз, і вярнуліся ў табар свой. Так рабілі шэсьць дзён.
15 У сёмы дзень, на сьвітаньні ўстаўшы, абыйшлі горад такім самым спосабам сем разоў. Толькі ў той дзень абыйшлі горад сем разоў.
16 Калі сьвятары за сёмым разам затрубілі ў трубы, Егошуа крыкнуў народу: «Крычыце! ГОСПАД аддаў вам гэты горад.
17 Няхай будзе горад пад закляцьцем! Ён і ўсё, што ў ім — для ГОСПАДА. Адна толькі Рахаў распусьніца будзе жыць разам з усімі, якія будуць з ёй у доме, бо яна схавала выведчыкаў, якіх мы паслалі.
18 Вы ж сьцеражыцеся, каб нічога абложанага закляцьцем ня бралі, каб і самім не падпасьці пад закляцьце, калі возьмеце [заклятае], бо тады вы зробіце праклятым увесь табар і прынесяцё яму няшчасьце.
19 Усё, што залатое або срэбнае, і посуд мядзяны, і жалеза — гэта сьвятыня для ГОСПАДА, і зьмешчаны яны будуць у скарбніцах Ягоных».
20 І народ падняў гармідар ваенны, і затрубілі ў трубы. Як толькі пачуў народ гук трубаў, закрычаў гучным крыкам ваенным, і муры разваліся на месцы, і народ увайшоў у горад, кожны напрасткі. І так занялі горад.
21 Сілай закляцьця ўсё прызначалі на сьмерць, і выбілі ўсіх, хто ў ім быў, ад мужчыны да жанчыны, ад дзіцяці да старога, і валоў, авечак і аслоў забілі мячом.
22 А двум мужчынам, якія былі выведчыкамі, Егошуа сказаў: «Ідзіце ў дом той жанчыны распусьніцы і прывядзіце яе і ўсё, што ейнае, як ёй пад прысягай абяцалі».
23 Юнакі пайшлі і прывялі Рахаў і бацькоў ейных, братоў ейных і ўсе рэчы, і сваякоў яе, і пакінулі па-за табарам.
24 А горад і ўсё, што ў ім было, спалілі, апрача срэбра, золата, мядзянага посуду і жалеза, якія аддалі ў скарбніцу Дому ГОСПАДА.
25 А Рахаў распусьніцу, і сям’ю бацькі ейнага, і ўсё, што мела, пакінуў Егошуа пры жыцьці. І абжылася яна сярод Ізраіля па сёньняшні дзень, бо яна схавала выведчыкаў, якіх паслаў Егошуа для выведваньня Ерыхону.
26 У той час Егошуа пакляўся і сказаў: «Няхай будзе пракляты перад абліччам ГОСПАДА чалавек, які ўзяўся б адбудаваць горад Ерыхон. За цану жыцьця першароднага свайго закладзе падваліны ягоныя, за цану жыцьця наймалодшага сына паставіць брамы».
27 І ГОСПАД быў з Егошуа, і слава ягоная разыйшлася па ўсёй зямлі.

Ег 7

1 А сыны Ізраіля дапусьціліся злачынства, бо ўзялі рэчы заклятыя, бо Ахан, сын Кармія, сына
Заўдыя, сына Зэраха, з калена Юды, узяў нешта з рэчаў заклятых. І разгневаўся ГОСПАД на
сыноў Ізраіля.
2 Егошуа паслаў з Ерыхону людзей у Гай, які каля Бэт-Авэну на ўсход ад Бэтэлю, кажучы ім:
«Ідзіце і выведайце зямлю». Яны пайшлі і агледзелі Гай,
3 і, вярнуўшыся, сказалі Егошуа: «Няхай не ідзе ўвесь народ, але няхай пойдуць дзьве або тры
тысячы і зьнішчаць горад. Не турбуй увесь народ, бо мала ворагаў».
4 І выбралася каля трох тысячаў ваяроў, але яны кінуліся ўцякаць перад жыхарамі Гаю.
5 Жыхары Гаю забілі з іх каля трыццаці шасьці чалавек, гонячы іх ад брамы аж да Шэбарыму,
і забівалі іх на спуску з гары. І саслабела сэрца народу, і сталася, як вада.
6 Тады Егошуа разьдзёр адзеньне сваё і ўпаў на аблічча сваё на зямлю перад Каўчэгам
ГОСПАДА, ён і старшыні Ізраіля, аж да вечара, і пасыпалі попелам галовы свае.
7 І маліўся Егошуа, кажучы: «О, Госпадзе, ГОСПАДЗЕ, чаму захацеў Ты пераправіць народ гэты
за раку Ярдан, каб выдаць нас у рукі Амарэйцаў і выгубіць? Лепш бы мы заставаліся і жылі за
Ярданам!
8 Госпадзе, што маю сказаць, калі бачу, як Ізраіль уцякае перад ворагамі?
9 Пачуюць Хананейцы і ўсе жыхары зямлі, і акружаць нас, і сатруць імя нашае з зямлі. І што
тады зробіш для імя Твайго вялікага?»
10 І сказаў ГОСПАД Егошуа: «Устань! Чаму ляжыш ніцма на зямлі?
11 Ізраіль саграшыў, яны парушылі запавет, які Я заключыў з імі, і ўзялі сабе тое, што было
заклятае, укралі гэта, затаілі і схавалі паміж рэчаў сваіх.
12 Таму сыны Ізраіля не ўстаялі перад ворагамі сваімі і ўцяклі ад іх, бо яны падпалі пад
закляцьце. Ня буду Я больш з вамі, пакуль ня вынішчыце спаміж сябе заклятага.
13 Устань, ачысьці народ і скажы ім: “Ачысьціцеся да заўтра, бо вось што кажа ГОСПАД, Бог
Ізраіля: "Заклятае ёсьць у цябе, Ізраілю! Таму не ўстаіцё перад ворагамі сваімі, пакуль ня
прымеце заклятага спаміж сябе"”.
14 Дзеля гэтага заўтра раніцаю будзеце падыходзіць па каленах, а калена, на якое ГОСПАД
пакажа жэрабям, няхай ідзе па родах, а род, на які пакажа ГОСПАД, няхай ідзе па сем’ях, а
сям’я, на якую пакажа ГОСПАД, няхай ідзе па адным чалавеку.
15 У каго знойдуцца рэчы заклятыя, будзе спалены разам з усім, што да яго належыць, бо ён
парушыў запавет ГОСПАДА і дапусьціўся злачынства ў Ізраілі».
16 І ўстаў Егошуа рана, і загадаў падыходзіць Ізраілю па каленах. І жэрабям паказана было
калена Юды.
17 І загадаў падыходзіць родам Юды, і жэрабям быў паказаны род Зэраха. І загадаў падыходзіць
роду Зэраха сем’ямі, і жэрабем паказана была сям’я Заўдыя.
18 І загадаў падыходзіць паасобным мужчынам з сем’ямі сваімі, і жэрабям быў паказаны Ахан,
сын Кармія, сына Заўдыя, сына Зэраха, з калена Юды.
19 І сказаў Егошуа Ахану: «Сыне мой, аддай славу ГОСПАДУ, Богу Ізраіля, і падзякуй, і скажы
мне, што ты зрабіў. Ня ўтойвай ад мяне».
20 І адказаў Ахан Егошуа, і сказаў: «Сапраўды, саграшыў я перад ГОСПАДАМ, Богам Ізраіля.
Вось што я зрабіў.
21 Убачыў я між здабычы прыгожы плашч з Шынэару, дзьвесьце сыкляў срэбра і залаты пруток
у пяцьдзясят сыкляў вагі. Зажадаў я іх, і забраў іх, і схаваў у зямлі ў сярэдзіне намёту майго,
а срэбра пад імі».
22 І Егошуа выслаў пасланцоў, і яны пабеглі ў намёт, і знайшлі там усё схаванае ў тым самым
месцы, і срэбра пад ім.
23 І забралі іх з сярэдзіны намёту, і прынесьлі да Егошуа і да ўсіх сыноў Ізраіля, і палажылі
перад абліччам ГОСПАДА.
24 І Егошуа ўзяў Ахана, сына Зэраха, срэбра, плашч і пруток золата, і сыноў ягоных, і дачок, і
валоў, і аслоў, і авечак, і сам намёт, і ўсё ягонае, і ўвесь Ізраіль з ім, і вывеў іх у даліну Ахор.

25 І там сказаў Егошуа: «За тое, што ты навёў на нас гора, няхай ГОСПАД навядзе на цябе гора
ў гэты дзень». І ўкаменаваў яго ўвесь Ізраіль камянямі, а [ўсё] ягонае агнём было спалена.
26 І накідалі на яго купу камянёў вялікую, якая [захавалася] да сёньняшняга дня. І адвярнуўся
гнеў ГОСПАДА ад іх, таму назвалі тое месца далінаю Ахор аж да сёньня.

Ег 8

1 І сказаў ГОСПАД Егошуа: «Ня бойся і не палохайся! Вазьмі з сабой усіх ваяроў, і ўстань, і
ідзіна Гай. Вось Я аддаў у рукі твае валадара Гаю, і народ ягоны, і горад ягоны, і зямлю ягоную.
2 Зробіш з Гаем і валадаром ягоным, як зрабіў ты з Ерыхонам і валадаром ягоным. Вазьміце
толькі сабе здабычу і жывёлу. Зрабі засаду на горад з другога боку [гораду]».
3 І ўстаў Егошуа і ўсе ваяры, каб ісьці на Гай. І выбраў Егошуа трыццаць тысячаў моцных
ваяроў, і выправіў іх уначы,
4 і загадаў ім, кажучы: «Станьце ў засаду за горадам і не адыходзьце далёка ад гораду. Будзьце
ўсе гатовыя.
5 А я і ўвесь народ, які са мной, наблізімся з другога боку гораду. Калі выйдуць яны супраць
нас як раней, мы будзем уцякаць перад імі.
6 Яны будуць гнацца за намі, і мы адцягнем іх далёка ад гораду, бо падумаюць, што мы ўцякаем
ад іх, як той раз.
7 І мы так будзем уцякаць, а вы выйдзеце з засады і захопіце горад. І аддасьць яго ГОСПАД, Бог
ваш, у рукі вашыя.
8 І захопіце яго, і спаліце яго. Так зрабіце паводле слова ГОСПАДА. Вось, я вам [гэта] загадаў».
9 І Егошуа паслаў іх, і яны пайшлі на месца засады, і затрымаліся між Бэтэлем і Гаем на захад
ад Гаю. А Егошуа начаваў тую ноч сярод народу.
10 Устаўшы рана раніцай, Егошуа агледзеў народ, і пайшоў ён і старшыні Ізраіля перад
абліччам народу.
11 Усе ваяры, што былі з ім, падыйшлі і наблізіліся да гораду, і затрымаліся з паўночнага боку
ад Гаю, а паміж горадам і імі была лагчына.
12 І [Егошуа] выбраў каля пяці тысячаў чалавек. і паставіў іх як засаду паміж Бэтэлем і Гаем, з
заходняга боку гораду.
13 І разлажыліся табарам на поўнач ад гораду, а апошняя дружына была на захад ад гораду. І
прыйшоў Егошуа ў тую ноч, і затрымаўся на сярэдзіне даліны.
14 Калі ўбачыў гэта валадар Гая, раніцай хутка вырушыў, і пасьпяшаўся з усім войскам сваім,
і накіраваўся ў бой супраць Ізраіля насупраць Арабы, ня ведаючы, што ў яго за плячыма
хаваецца засада.
15 А Егошуа і ўвесь Ізраіль сталі адыходзіць, і ўцякалі дарогаю ў пустыню.
16 І быў скліканы ўвесь народ, які быў у Гаі, каб даганяць іх, і яны пагналіся за імі. І гналіся за
Егошуа, і адыйшліся далёка ад гораду,
17 і нікога не засталося ў Гаі і ў Бэтэлі, хто б не пагнаўся за Ізраілем. І пакінулі яны горад
адкрытым, і гналіся за Ізраілем.
18 І сказаў ГОСПАД Егошуа: «Падымі дзіду, якую трымаеш у руцэ тваёй, супраць гораду Гай, бо
Я аддам яго ў рукі твае». І ўзьняў Егошуа дзіду, якая была ў руцэ ягонай, супраць гораду.
19 Калі ён падняў дзіду супраць гораду, людзі, якія былі ў засадзе, падняліся і пабеглі ў горад,
і захапілі яго, і падпалілі яго.
20 А людзі з гораду, якія гналіся за Егошуам, аглянуўшыся і бачачы дым над горадам, які аж
пад неба ўздымаўся, не маглі анікуды ўцякаць, бо тыя, што ўцякалі ў бок пустыні, павярнуліся
супраць іх.
21 Егошуа і ўвесь Ізраіль, бачачы, што горад узяты і што дым уздымаецца над горадам,
павярнуліся і ўдарылі на людзей Гаю.
22 А тыя, якія занялі горад і падпалілі яго, выйшлі з гораду супраць іх, і так яны апынуліся
паміж Ізраілем, які акружыў іх з абодвух бакоў. І ўдарылі іх [сыны Ізраіля], і не пакінулі нікога,
хто ўратаваўся.
23 А валадара Гаю схапілі і жывога прывялі да Егошуа.

24 І выбілі Ізраільцяне ўсіх жыхароў Гая, якія пагналіся за імі, калі яны ўцякалі, і на тым самым
полі былі яны пазасяканыя мячом. І вярнуўся ўвесь Ізраіль у Гай, і выбіў яго вострывам мяча.
25 У той дзень загінула мужчынаў і жанчынаў дванаццаць тысячаў, усе жыхары Гая.
26 А Егошуа не апускаў рукі сваёй, якую выцягнуў уверх, трымаючы дзіду, пакуль не былі
выбіты ўсе жыхары Гаю.
27 Толькі жывёлу і здабычу з гораду падзялілі паміж сабою Ізраільцяне, як загадаў ГОСПАД
Егошуа.
28 Егошуа спаліў Гай і зрабіў з яго вечныя руіны, пустэчу аж да сёньняшняга дня.
29 А валадара Гаю павесіў на дрэве аж да вечара. На заходзе сонца загадаў Егошуа зьняць
парэшткі ягоныя з дрэва, і кінулі яго каля ўваходу ў брамы гораду і накідалі над ім купу
камянёў, якая [захавалася] да сёньня.
30 Тады Егошуа паставіў ахвярнік ГОСПАДУ, Богу Ізраіля, на гары Эваль,
31 як загадаў Майсей, слуга ГОСПАДА, сынам Ізраіля, і што запісана ў кнізе Закону Майсея,
ахвярнік з цэлых камянёў, ня чэсаных жалезам. На ім складзена было цэласпаленьне
ГОСПАДУ, і склалі ахвяры мірныя.
32 І напісаў ён там на тых камянях водпіс Закону Майсея, які напісаў [Майсей] для сыноў
Ізраіля.
33 І ўвесь Ізраіль, і старшыні ягоныя, і начальнікі народу, і судзьдзі, сталі з аднаго і другога боку
Каўчэга, насупраць сьвятароў і лявітаў, якія носяць Каўчэг Запавету ГОСПАДА, як прыхадні,
так і тутэйшыя. Палова іх стала каля гары Гарызім, а другая палова — каля гары Эваль, як
загадаў раней Майсей, слуга ГОСПАДА, каб дабраславіць народ Ізраіля.
34 І пасьля прачытаў Егошуа ўсе словы Закону, дабраславенства і праклён, паводле ўсяго таго,
што было напісана ў кнізе Закону.
35 Не прапусьціў Егошуа анічога з таго, што загадаў Майсей, але ўсё прачытаў перад усёй
царквой Ізраіля, перад жанчынамі, і дзецьмі, і прыхаднямі, якія між іх хадзілі.

Ег 9

1 І пачулі пра гэта ўсе валадары, што жылі за Ярданам, якія жылі на гарах, і ў даліне, і на беразе
Мора Вялікага аж да Лібану, Хеты і Амарэйцы, Хананейцы, Пэрэзэі, Хівеі і Евусэі,
2 і злучыліся разам, каб супольна ваяваць супраць Егошуа і Ізраіля.
3 А жыхары Гібэону, чуючы ўсё, што зрабіў Егошуа з Ерыхонам і Гаем,
4 абдумалі хітрасьць, і пайшлі, і ўзялі з сабою ў дарогу харчы, і ўсклалі старыя мяхі на аслоў і
пустыя мяхі на віно, падзёртыя і палатаныя,
5 і на нагах мелі падзёрты абутак, і апрануліся ў старое адзеньне, і ўвесь іхні хлеб падарожны
быў сухі і паламаны.
6 І прышлі яны да Егошуа ў табар у Гільгале, і сказалі яму і ўсім мужам Ізраілю: «Прыйшлі мы
з далёкай зямлі, і цяпер заключыце запавет з намі».
7 І сказалі Ізраільцяне Хівеям: «А можа вы блізка каля нас жывецё, і мы ня можам заключаць
запавет з вамі?»
8 А яны сказалі Егошуа: «Слугі мы твае». І Егошуа сказаў ім: «Хто вы і адкуль прыйшлі?»
9 Яны сказалі яму: «З далёкай вельмі зямлі прыйшлі слугі твае ў імя ГОСПАДА, Бога твайго.
Бо мы чулі пра славу магутнасьці Ягонай, пра ўсё, што ўчыніў Ён у Эгіпце,
10 і што зрабіў двум валадарам Амарэйскім за Ярданам, Сыгону, валадару Хешбону, і Огу,
валадару Башану, які быў у Аштароце.
11 І сказалі нам старшыні і ўсе жыхары зямлі нашай: “Вазьміце харчы ў дарогу і скажыце ім
пры сустрэчы: "Слугі мы вашыя, заключыце з намі запавет"”.
12 Вось хлеб наш. Калі мы выходзілі з дамоў нашых, каб ісьці да вас, узялі мы яго цёплым;
цяпер жа зрабіўся ён сухі і паламаны.
13 Мяхі новыя мы налілі віном, а цяпер яны парваліся; адзеньне, у якое апранутыя, і сандалы,
якія маем на нагах, дзеля далёкай дарогі падзёрліся, ледзь трымаюцца».
14 Ізраільцяне пакаштавалі хлеб іхні, але што скажа ГОСПАД, не спыталіся.

15 І заключыў Егошуа мір з імі, і заключыў з імі запавет, і абяцаў ім жыцьцё, а князі грамады
пацьвердзілі гэта ім прысягаю.
16 Праз тры дні пасьля заключэньня запавету [Ізраільцяне] пачулі, што яны жывуць у суседзтве
і блізка іх.
17 І сыны Ізраіля вырушылі, і ў трэці дзень прыйшлі ў гарады іхнія, а гарады іхнія Гібэон,
Кефіра, Бэерот і Кірыят-Ярым.
18 І сыны Ізраіля не пазабівалі іх, бо запрысягнулі ім князі грамады ў імя ГОСПАДА, Бога
Ізраіля. І наракала ўся грамада на князёў.
19 І сказалі ўсе князі да ўсёй грамады: «Мы прысягалі ім у імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля, і дзеля
гэтага ня можам іх чапаць.
20 Але зробім з імі так: захаваем іх пры жыцьці, каб не сьцягнуць гневу ГОСПАДА супраць сябе
дзеля прысягі, якой мы запрысягліся».
21 І сказалі ім князі: «Няхай яны жывуць, але няхай сякуць дровы і носяць ваду для ўсёй
грамады». Так прамовілі ім князі.
22 І паклікаў Егошуа [жыхароў Гібэону], і сказаў ім: «Чаму вы захацелі нас ашукаць падступна,
кажучы: "Мы ад вас вельмі далёка жывём", калі вы блізка нас жывіцё?
23 І цяпер вы будзеце пад праклёнам і ніхто з вашага роду не перастане секчы дровы і насіць
ваду ў Дом Бога майго».
24 І яны адказалі Егошуа, і сказалі: «Мы, слугі твае, даведаліся, што ГОСПАД, Бог твой, загадаў
слузе Свайму, Майсею, што аддасьць вам усю зямлю гэтую і зьнішчыць усіх жыхароў зямлі
гэтай перад абліччам вашым. І мы дужа баяліся за жыцьцё нашае перад абліччам вашым, і
вырашылі так зрабіць.
25 І цяпер мы ў руках тваіх.Што добра і справядліва ў вачах тваіх, рабі з намі».
26 І [Егошуа] так зрабіў з імі, і вызваліў іх ад рукі сыноў Ізраіля, і не былі яны забітыя.
27 У той дзень паставіў іх Егошуа, каб яны секлі дровы і насілі ваду для грамады і для ахвярніка
ГОСПАДА аж да цяперашняга часу на месцы, якое [Госпад] выбярэ.

Ег 10

1 Адоніцэдэк, валадар Ерусаліму, пачуў, што Егошуа заняў Гай і аблажыў яго закляцьцем, і
што зрабіў ён з Гаем і валадаром ягоным так, як зрабіў з Ерыхонам і валадаром ягоным, і што
заключылі жыхары Гібэону мір з Ізраілем, і жылі пасярод іх,
2 і моцна стрывожыўся, бо Гібэон быў горадам вялікім, як адзін з гарадоў валадарскіх, і большы
за Гай, і ўсе яго жыхары былі волатамі.
3 І паслаў Адоніцэдэк, валадар Ерусаліму, пасланцоў да Гагама, валадара Хеўрону, і да Пірама,
валадара Ярмуту, і да Яфія, валадара Ляхішу, і да Дэбіра, валадара Эглёну, кажучы:
4 «Прыйдзіце да мяне і дапамажыце мне, і паб'ем жыхароў Гібэону, бо яны заключылі мір з
Егошуа і сынамі Ізраіля».
5 І яны зыйшліся, і злучыліся разам пяць валадароў Амарэйскіх: валадар Ерусаліму, валадар
Хеўрону, валадар Ярмуту, валадар Ляхішу, валадар Эглёну, з войскамі сваімі. І разлажыліся
яны табарам каля Гібэону, і ваявалі супраць яго.
6 І жыхары Гібэону паслалі да Егошуа, які быў тады ў табары ў Гільгале, і прасілі яго: «Ня
стрымлівай рукі тваёй, каб даць дапамогу слугам тваім! Пасьпяшайся хутка і абарані нас,
прыйдзі з дапамогаю, бо зыйшліся супраць нас усе валадары Амарэйскія, якія жывуць у
гарах».
7 І пайшоў Егошуа з Гільгалу, і ўсе ваяры з ім, ваяры мужныя.
8 І сказаў ГОСПАД Егошуа: «Ня бойся іх, бо ў рукі твае Я аддаю іх. Ніхто з іх ня зможа ўстаяць
перад табою».
9 І неспадзявана напаў на іх Егошуа, а ён усю ноч ішоў з Гільгалу.
10 І напалохаў іх ГОСПАД зьяўленьнем Ізраіля, і зрабіў ім вялікую паразу ў Гібэоне, і гналі іх
[сыны Ізраіля] ў бок узгорку Бэт-Харон, і білі іх аж да Азэкі і Македы.

11 Калі ўцякалі яны перад Ізраілем і былі на схіле гары Бэт-Харон, ГОСПАД кідаў на іх вялікія
камяні з неба аж да Азэкі, і больш іх паўмірала ад камянёў градавых, чым ад мяча сыноў
Ізраіля.
12 У той дзень, калі выдаў ГОСПАД Амарэйцаў сынам Ізраіля, сказаў Егошуа ГОСПАДУ на вачах
Ізраіля: «Стой, сонца, над Гібэонам, і ты, месяц, над далінай Аялона.
13 І затрымалася сонца, і стаў месяц, аж адпомсьціў народ ворагам сваім». Ці ж не запісана гэта
ў Кнізе Справядлівага: «І стала сонца на сярэдзіне неба і ўвесь дзень не спяшалася заходзіць»?
14 Не было падобнага дня ані перад тым, ані потым, каб ГОСПАД так паслухаў голас чалавека,
бо ГОСПАД ваяваў на баку Ізраіля.
15 І вярнуўся Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, у табар у Гільгал.
16 А пяць валадароў уцяклі і схаваліся ў пячоры каля Македы.
17 І паведамілі Егошуа, што пяць валадароў знойдзены і што яны хаваюцца ў пячоры каля
Македы.
18 І сказаў Егошуа: «Закрыйце ўваход у пячору вялікімі камянямі і пастаўце людзей, каб іх
пільнавалі.
19 А вы ня стойце, але перасьледуйце ворагаў, забіваючы захопленых, і не дазвольце ім
увайсьці ў гарады свае за дапамогаю, бо ГОСПАД, Бог ваш, выдаў іх у рукі вашыя».
20 Егошуа і сыны Ізраіля зрабілі вялікае зьнішчэньне сярод ворагаў сваіх, што толькі рэшткі
змаглі ўцячы ад іх у гарады ўмацаваныя.
21 І ўсё войска вярнулася да Егошуа ў Македу ў табар, жывыя і здаровыя, і ніхто не адважыўся
нават языком варухнуць супраць сыноў Ізраіля.
22 І сказаў Егошуа: «Адкрыйце ўваход у пячору і прывядзіце да мяне пяць валадароў з пячоры».
23 І зрабілі так, і прывялі да яго пяць валадароў з пячоры: валадара Ерусаліму, валадара
Хеўрону, валадара Ярмуту, валадара Ляхішу і валадара Эглёну.
24 Калі яны былі прыведзеныя да яго, ён паклікаў усіх Ізраільцянаў і сказаў начальнікам
войска, якія былі з ім: «Хадзіце і пастаўце ногі на каркі валадароў гэтых». І яны падыйшлі,
і паставілі ногі свае на каркі іхнія.
25 І Егошуа сказаў ім: «Ня бойцеся і не палохайцеся, будзьце цьвёрдыя і мужныя! Так ГОСПАД
зробіць усім ворагам вашым, супраць якіх будзеце змагацца».
26 І ўдарыў іх Егошуа, і забіў іх, і павесіў на пяці дрэвах, і віселі яны аж да вечара.
27 І ў часе заходу сонца загадаў Егошуа, і зьнялі іх з дрэваў, і ўкінулі іх у пячору, у якой хаваліся,
і закідалі ўваход вялікімі камянямі, якія [там] аж да сёньня.
28 У той дзень здабыў Егошуа Македу і зьнішчыў яе вострывам мяча, і забіў валадара яе і ўсіх
жыхароў яе. Не пакінуў у ёй анікога, і зрабіў валадару Македы так, як зрабіў валадару Ерыхону.
29 І з Македы перайшоў Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, у Лібну, і ваяваў супраць яе.
30 І выдаў Лібну ГОСПАД разам з валадаром ейным у рукі Ізраіля, і яны зьнішчылі горад
вострывам мяча і ўсіх жыхароў ягоных, і не пакінулі анікога, і ўчынілі валадару Лібны, як
зрабілі валадару Ерыхону.
31 З Лібны Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, перайшоў у Ляхіш і стаў табарам каля яго, і ваяваў
супраць яго.
32 І аддаў ГОСПАД Ляхіш у рукі Ізраіля, і ён заняў яго на другі дзень, і выгубіў вострывам мяча
ўсякую душу, што была ў ім, як зрабіў раней у Лібне.
33 Тады прыйшоў Гарам, валадар Гезэру, дапамагчы Ляхішу, але Егошуа зьнішчыў яго і ўвесь
народ ягоны аж да поўнага вынішчэньня.
34 І перайшоў Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, з Ляхішу ў Эглён, і стаў табарам каля яго, і ваяваў з
ім.
35 І ў той самы дзень захапіў яго, і выбіў вострывам мяча ўсякую душу, што была ў ім, і аддаў
закляцьцю, як зрабіў у Ляхішы.
36 І перайшоў Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, з Эглёну ў Хеўрон, і ваяваў з ім.
37 І здабыў яго, і выбіў мячом яго, і валадара ягонага, і ўсе гарады ягоныя, і ўсякую душу, што
там жыла. Не пакінуў анікога там, і зрабіў так, як зрабіў у Эглёне, і аддаў закляцьцю ўсякую
душу, што ў ім.

38 І павярнуў Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, у Дэбір, і ваяваў з ім.
39 І здабыў яго, і валадара ягонага, і ўсе гарады ягоныя вынішчыў вострывам мяча, і аддаў
закляцьцю ўсякую душу ў ім, і не пакінуў рэшткі. Як зрабіў з Хеўронам і Лібнай і з валадарамі
іхнімі, так зрабіў з Дэбірам і валадаром ягоным.
40 І заваяваў Егошуа ўсю зямлю, і гару, і Нэгеў, і Шэфэлю, і схілы гор, і ўсіх валадароў іхніх.
Не пакінуў у іх ніякіх рэшткаў, але ўсякую душу ў іх аддаў закляцьцю, як загадаў ГОСПАД, Бог
Ізраіля.
41 І Егошуа пабіў іх ад Кадэш-Барнэа аж да Газы, усю зямлю Гашэн аж да Гібэону.
42 І ўсіх тых валадароў і землі іхнія Егошуа захапіў адным паходам, бо ГОСПАД, Бог Ізраіля,
ваяваў на баку Ізраіля.
43 І вярнуўся Егошуа, і ўвесь Ізраіль з ім, у табар у Гільгал.

Ег 11

1 І сталася, што Явін, валадар Хацору, пачуў пра гэта, і змовіўся з Ёвавам, валадаром Мадону,
і з валадаром Шымрону, і з валадаром Ахшафу,
2 і з валадарамі поўначы, якія жылі ў гарах і ў Арабе з паўднёвага боку Кінэрэту, і ў Шэфэлі, і
на ўзвышшах Дору каля мора,
3 з Хананейцамі на ўсходзе і на захадзе, з Амарэйцамі, Хетамі, Пэрэзэямі, Евусэямі, з Хівеямі,
якія [жывуць] каля падножжа Гермону ў зямлі Міцпа.
4 Выйшлі яны ўсе з дружынамі сваімі, народ шматлікі, быццам пясок на беразе мора, і коньнікі,
і калясьніцы ў вялікай лічбе.
5 І сабраліся ўсе гэтыя валадары, і разлажыліся табарам у адным месцы каля водаў Мэрому,
каб ваяваць супраць Ізраіля.
6 І сказаў да Егошуа ГОСПАД: «Ня бойся іх, бо заўтра ў гэты самы час Я пакладу іх забітымі
перад абліччам Ізраіля. Коні іхнія ты акульгавіш, а калясьніцы іхнія спаліш агнём».
7 І Егошуа і ўсё войска ягонае з ім прыйшлі раптоўна да водаў Мэрому, і напалі на іх.
8 І аддаў іх ГОСПАД у рукі Ізраіля, і ён разьбіў іх, і гнаўся за імі аж да Вялікага Сідону і Місрэфот-
Маіму і аж да даліны Міцпа на ўсходзе, і забівалі іх, і не пакінулі ў іх рэшткаў.
9 І зрабіў Егошуа так, як яму сказаў ГОСПАД: коні іхнія акульгавіў, а калясьніцы іхнія спаліў
агнём.
10 У той час Егошуа вярнуўся і здабыў Хацор, і валадара ягонага забіў мячом, а Хацор перад
гэтым быў сталіцай усіх валадарстваў гэтых.
11 І выбіў ён усякую душу, што там была, вострывам мяча, і аддаў закляцьцю, і не пакінуў
анікога, а Хацор спаліў анём.
12 І ўсе гарады, і валадароў іхніх Егошуа забіў вострывам мяча, і аддаў закляцьцю, як загадаў
Майсей, слуга ГОСПАДА.
13 Толькі ўсе гарады, што стаяць на ўзгорышчы, не паліў Ізраіль, акрамя Хацору, які спаліў
Егошуа.
14 І ўсю здабычу з гэтых гарадоў і жывёлу падзялілі сыны Ізраіля паміж сабою. Толькі людзей
усіх выбілі вострывам мяча аж да вынішчэньня іх, не пакідаючы нікога, хто дыхае.
15 Як загадаў ГОСПАД Майсею, слузе Свайму, так загадаў Майсей Егошуа, і Егошуа ўсё выканаў;
не прапусьціў аніводнага слова з таго, што загадаў ГОСПАД Майсею.
16 І Егошуа завалодаў усёю зямлёю гэтаю: гарамі, і ўсім Нэгевам, і ўсёю зямлёю Гашэн, і
Шэфэлёй, і Арабай, і гарамі Ізраіля, і раўнінамі іхнімі,
17 ад гары Халак, якая падымаецца да Сэіру, аж да Баал-Гаду ў даліне Лібану, каля падножжа
гары Гермон. А ўсіх валадароў іхніх перамог і забіў іх.
18 Шмат дзён Егошуа ваяваў супраць валадароў гэтых.
19 Ніводзін горад не заключыў міру з сынамі Ізраіля, апрача Хівеяў, жыхароў Гібэону. Усе
[гарады] былі ваяваньнем здабытыя.

20 Бо ад ГОСПАДА было, каб зрабіць цьвёрдымі сэрцы іхнія, каб яны ваявалі супраць Ізраіля
і каб аддаць іх закляцьцю, і не было для іх міласэрнасьці, але каб вынішчыць іх, як загадаў
ГОСПАД Майсею.
21 У той час Егошуа прыйшоў і выбіў сыноў Анака ў гарах, у Хеўроне, і ў Дэбіры, і ў Анаве, і ў-ва
ўсіх гарах Юды, і ў-ва ўсіх гарах Ізраілю, і Егошуа аддаў закляцьцю іх і ўсе гарады іхнія.
22 Не засталося [сыноў] Анака ў зямлі сыноў Ізраіля, толькі ў гарадах Газа, Гат і Ашдод яны
засталіся.
23 І захапіў Егошуа ўсю зямлю, як прамовіў ГОСПАД да Майсея, і аддаў яе ў спадчыну сынам
Ізраіля, падзяліўшы для каленаў іхніх. І зямля супакоілася ад войнаў.

Ег 12

1 Вось валадары той зямлі, якіх забілі сыны Ізраіля і завалодалі зямлёю іхняй за Ярданам, на
ўсход сонца, ад ручая Арнон аж да гары Гермон, разам з усёй Арабай на ўсходзе.
2 Сыгон, валадар Амарэйцаў, які жыў у Хешбоне і валодаў паловай Гілеаду ад Араэру, што на
беразе ручая Арнон, ад сярэдзіны даліны аж да ручая Ябок, мяжы сыноў Амона,
3 а на ўсходзе праз Арабу аж да мора Кінэрэт і мора Арабы або Мора Салёнага, у напрамку
Бэт-Гаешымоту, і далей на поўдзень да падножжа Пісгі.
4 Пасьля Ог, валадар Башану, апошні з Рэфаімаў, які жыў у Аштароце і ў Эдрэі,
5 і панаваў у гарах Гермону, і ў Сальсе, а таксама над усім Башанам аж да мяжы з Гешурам і
Маахай, і над паловай Гілеаду, аж да мяжы Сыгона, валадара Хешбону.
6 Майсей, слуга ГОСПАДА, і сыны Ізраіля забілі іх. І аддаў зямлю іхнюю Майсей на пасяленьне
[сынам] Рубэна і Гада, і палове калена Манасы.
7 А вось валадары зямлі, якіх забіў Егошуа і сыны Ізраіля за Ярданам на захад, ад Баал-Гаду ў
даліне Лібану аж да гары Халак, якая падымаецца да Сэіру, якую аддаў Егошуа на ўласнасьць
каленам Ізраіля, адпаведна да іх падзелу,
8 на гары і ў Шэфэлі, у Арабе і на схілах гары, у стэпе і ў Нэгеве, зямлю Хетаў, Амарэйцаў,
Хананейцаў, Пэрэзэяў, Хівеяў і Евусэяў:
9 валадар Ерыхону — адзін, валадар Гаю, што побач Бэтэлю — адзін;
10 валадар Ерусаліму — адзін, валадар Хеўрону — адзін,
11 валадар Ярмуту — адзін, валадар Ляхішу — адзін,
12 валадар Эглёну — адзін, валадар Гезэру — адзін,
13 валадар Дэбіру — адзін, валадар Гедэру — адзін,
14 валадар Хармы — адзін, валадар Араду — адзін,
15 валадар Лібны — адзін, валадар Адуляму — адзін,
16 валадар Македы — адзін, валадар Бэтэлю — адзін,
17 валадар Тапуаху — адзін, валадар Хэфэру — адзін,
18 валадар Афэку — адзін, валадар Лашарону — адзін,
19 валадар Мадону — адзін, валадар Хацору — адзін,
20 валадар Шымрону — адзін, валадар Ахшафу — адзін,
21 валадар Таанаху — адзін, валадар Мэгіддо — адзін,
22 валадар Кадэшу — адзін, валадар Ёкнэаму, што каля Кармэлю — адзін,
23 валадар Дору з узвышшаў Дор — адзін, валадар паганаў з Гільгалу — адзін,
24 валадар Тырцы — адзін; усіх валадароў — трыццаць адзін.

Ег 13

1 Калі Егошуа састарэў і меў шмат дзён, сказаў яму ГОСПАД: «Ты састарэў і маеш шмат дзён,
але яшчэ вельмі шмат зямлі застаецца незанятай.
2 Вось гэтая зямля, якая засталася: усе акругі Філістынцаў і ўвесь Гешур,
3 ад Шыхору, на ўсход ад Эгіпту аж да мяжы Экрону на поўначы, зямля Ханаан, якая дзеліцца
паміж пяцьцю князямі Філістынскімі з Газы, Ашдоду, Ашкелёну, Гату і Экрону, і Авеямі на
поўдні;

4 уся зямля Хананейцаў ад Мэары Сідонскай аж да Афэку і мяжы Амарэйцаў.
5 І зямля Гіблі і ўвесь Лібан на ўсходзе ад Баал-Гаду, што каля падножжа гары Гермон, аж да ўваходу ў Хамат.
6 Усіх, што жывуць у гарадах ад Лібану аж да Місрэфот-Маіму на захад, усіх Сідонцаў Я выганю перад абліччам сыноў Ізраіля. Толькі жэрабям падзялі зямлю ў спадчыну між сынамі Ізраіля, як Я загадаў табе.
7 І цяпер падзялі зямлю гэтую ў спадчыну дзевяці каленам і палове калена Манасы».
8 А [сыны] Рубэна і Гада, і [палова Манасы] атрымалі спадчыну сваю ад Майсея на ўсходзе за Ярданам, як даў ім Майсей, слуга ГОСПАДА,
9 ад Араэру, які на беразе ручая Арнон, і гораду, які ў сярэдзіне даліны, і ўсю раўніну ад Мэдэвы да Дыбону,
10 і ўсе гарады Сыгона, валадара Амарэйскага, які валадарыў у Хешбоне, аж да мяжы сыноў Амона,
11 і Гілеад, і мяжу з Гешурам і Маахай, і ўсю гару Гермон, і ўвесь Башан аж да Салхі,
12 усё валадарства Ога, які валадарыў у Аштароце і Эдрэі, які быў апошнім з Рэфаімаў, а Майсей пабіў іх і выгнаў.
13 Але сыны Ізраіля ня выгналі [сыноў] Гешура і Мааха, і жывуць яны сярод Ізраіля да сёньняшняга дня.
14 Толькі калену Левія ня дадзена спадчыны. Ахвяры агнявыя ГОСПАДУ, Богу Ізраіля — гэта спадчына ягоная, як прамовіў да яго [Госпад].
15 І Майсей даў пакаленьню сыноў Рубэна частку паводле сем'яў іхніх.
16 Атрымалі яны абшар ад Араэру на беразе ручая Арнон, і горад у сярэдзіне даліны, і ўвесь абшар аж да Мэдэбы,
17 Хешбон і ўсе гарады ягоныя, якія на раўніне: Дыбон, Бамот-Баал, Бэт-Баал-Мэон,
18 Ягцу, Кедэмот і Мэфаат,
19 Кірыятаім, Сібму і Цэрэт-Гешшахар на гары, [якая] на раўніне,
20 Бэт-Пэор і схілы Пісгі, і Бэт-Гаешымот,
21 і ўсе гарады на раўніне, і ўсё валадарства Сыгона, валадара Амарэйскага, які валадарыў у Хешбоне, якога забіў Майсей, яго і начальнікаў Мадыянскіх: Эвія, Рэкема, Цура, Хура, Рэву, князёў Сыгона, якія жылі ў той зямлі.
22 І варажбіта Білеама, сына Бэора, забілі сыны Ізраіля мячом разам з іншымі забітымі.
23 Мяжой абшару сыноў Рубэна быў Ярдан. Гэта спадчына сыноў Рубэна паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
24 І даў Майсей [зямлю] пакаленьню сыноў Гада паводле сем'яў іхніх.
25 Яны атрымалі абшар: Язэр, і ўсе гарады Гілеаду, і палову зямлі сыноў Амона аж да Араэру, насупраць Раббы,
26 і ад Хешбону да Рама-Міцпы і Бэтаніму і ад Маханаіму да мяжы Лё-Дэбару,
27 а ў даліне — Бэтгарам, Бэтнімру, Суккот і Цафон, рэшту валадарства Сыгона, валадара Хешбону, Ярдан і ваколіцы ягоныя аж да мора Кінэрэт за Ярданам на ўсход.
28 Гэта спадчына сыноў Гада паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
29 І даў Майсей [зямлю] палове калена Манасы паводле сем'яў іхніх.
30 І яны атрымалі абшар ад Маханаіму, увесь Башан, усё валадарства Ога, валадара Башану, усе паселішчы Яіра, якія ў Башане, шэсьцьдзясят гарадоў.
31 А палову Гілеаду, Аштарот і Эдрэю, гарады валадарства Ога ў Башане, [атрымалі] сыны Махіра, сына Манасы, палова сыноў Махіра паводле сем'яў сваіх.
32 Гэтую спадчыну падзяліў Майсей на раўнінах Мааву за Ярданам насупраць Ерыхону, на ўсход ад Ерыхону.
33 А калену Левія ня даў спадчыны Майсей, бо ГОСПАД, Бог Ізраіля, Ён — спадчына іхняя, як Ён прамовіў да іх.

Ег 14

1 А вось гэта атрымалі ў спадчыну сыны Ізраіля ў зямлі Ханаан, якую падзялілі Элеазар сьвятар
і Егошуа, сына Нуна, і галовы дамоў пакаленьняў Ізраіля.
2 Спадчына іхняя была падзелена жэрабям, як загадаў ГОСПАД праз Майсея, дзевяці
пакаленьням і палове пакаленьня Манасы.
3 Бо двум пакаленьням і палове пакаленьня Манасы даў Майсей спадчыну на тым баку Ярдану,
а лявітам ня даў спадчыны між іх,
4 бо ад сыноў Язэпа выйшлі два пакаленьні: Манасы і Эфраіма, а лявітам ня дадзена на
ўласнасьць зямлі, а толькі гарады на жыцьцё і пашы пры гарадах для статкаў іхніх і маёмасьці
іхняй.
5 Як загадаў ГОСПАД Майсею, так і зрабілі сыны Ізраіля, і так падзялілі зямлю.
6 І прыйшлі сыны Юды да Егошуа ў Гільгале, і сказаў Халеў, сын Ефунны, Кенэзей: «Ты ведаеш
слова, якое прамовіў ГОСПАД да Майсея, чалавека Божага, пра мяне і пра цябе ў Кадэш-Барнэа.
7 Сорак гадоў я меў, калі Майсей, слуга ГОСПАДА, паслаў мяне з Кадэш-Барнэа выведаць
зямлю. І я прынёс яму слова, якое [было] ў сэрцы маім.
8 А браты мае, якія хадзілі разам са мною, напалохалі сэрцы народу, але я пайшоў за
ГОСПАДАМ, Богам маім.
9 У той дзень Майсей прысягнуў, кажучы: “Зямля, на якую ступіла нага твая, будзе спадчынай
тваёй і сыноў тваіх на вякі, бо ты пайшоў за ГОСПАДАМ, Богам маім”.
10 І вось, захаваў мяне ГОСПАД пры жыцьці, як абяцаў. Ужо сорак пяць гадоў мінула, як ГОСПАД
прамовіў словы гэтыя да Майсея, калі яшчэ Ізраіль вандраваў праз пустыню. Цяпер я маю
восемдзясят пяць гадоў,
11 але яшчэ сёньня я дужы як у дзень, калі пасылаў мяне Майсей; колькі ў мяне тады было
сілы, столькі і цяпер маю для таго, каб ваяваць і каб выходзіць і вяртацца.
12 Таму дай ты мне гару гэтую, якую абяцаў мне ГОСПАД у той дзень. Ты сам чуў у той дзень,
што там [сыны] Анака і гарады вялікія і ўмацаваныя. Калі ГОСПАД са мною, я здабуду іх, як
ГОСПАД прамовіў».
13 І дабраславіў Егошуа Халева, сына Ефунны, і даў яму ў спадчыну Хеўрон.
14 Дзеля гэтага Хеўрон як спадчына належыць Халеву, сыну Ефунны, Кенэзею, аж па
сёньняшні дзень, бо ён пайшоў за ГОСПАДАМ, Богам Ізраіля.
15 Хеўрон раней называўся Кірыят-Арба, бо [Арба] быў найвялікшым чалавекам сярод [сыноў]
Анака. І зямля жыла ў супакоі ад войнаў.

Ег 15

1 Пакаленьне сыноў Юды жэрабям атрымала [спадчыну] паводле сем'яў сваіх: да мяжы Эдому,
да пустыні Сін, насупраць Нэгеву на поўдзень аж да канца паўднёвага.
2 Іх мяжа паўднёвая ішла ад канца Мора Салёнага, ад паўднёвай затокі,
3 і кіравалася далей на поўдзень ад Маале-Акрабіму, і праходзіла праз Сін, і ўзыходзіла на
поўдзень да Кадэш-Барнэа, і ішла да Хецрону, і ўзыходзіла да Адару, і паварочвала да Карка,
4 і пераходзіла да Ацмону, і даходзіла да ручая Эгіпецкага, і спынялася на беразе мора. Такая
была іх мяжа паўднёвая.
5 Мяжа ўсходняя — Мора Салёнае аж да вусьця Ярдану. Мяжа ад поўначы пачыналася ад затокі
мора каля вусьця Ярдану,
6 і ўзьнімалася да Бэт-Хоглі, і праходзіла на поўначы да Бэт-Арабы, і ўзьнімалася мяжа да Эвэн-
Баган-Бэн-Рэўбэн.
7 І ўзьнімалася мяжа да Дэбіру ад даліны Ахор і заварочвала на поўнач да Гільгалу, які
насупраць Маале-Адумім, што на поўдзень ад ручая; і ішла мяжа да Мэ-Эн-Шэмэшу, і
сканчвалася пры Эн-Рагелі.
8 І ўзьнімалася мяжа лагчынай Бэн-Гінном паўднёвым схілам гор Евусэяў, значыць праз
Ерусалім, і ўзыходзіла на верх гары, якая насупраць лагчыны Гінном ад захаду і на скраю
паўночным лагчыны Рэфаім.

9 З вяршыні гары заварочвала мяжа да крыніцы Мэ-Нэфтаах і вяла да гарадоў гары Эфрон, і
заварочвала мяжа да Баалы або Кірыят-Ярыму.
10 З Баалы мяжа ішла на захад да гары Сэір і праходзіла праз паўночны схіл гары Ярым,
значыць Кесалён, і зыходзіла да Бэт-Шэмэшу, і пераходзіла праз Тымну.
11 І даходзіла мяжа да паўночнага схілу Экрону, і заварочвала да Шыкарону, і пераходзіла праз
гару Баалы, і набліжалася да Ябнээля, і спынялася на беразе мора.
12 Мяжой заходняй было Мора Вялікае з узьбярэжжам сваім. Гэта мяжа сыноў Юды наўкола
паводле сем'яў іхніх.
13 Халеў, сын Ефунны, атрымаў частку між сыноў Юды паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА да
Егошуа, — Кірыят-Арбу, бацьку Анака, значыць Хеўрон.
14 Адтуль Халеў выгнаў трох сыноў Анака: Шэшая, Ахімана і Тальмая з роду Анака.
15 Адтуль ён вырушыў супраць жыхароў Дэбіру, а Дэбір раней называўся Кірыят-Сэфэр.
16 І сказаў Халеў: «Таму, хто здабудзе Кірыят-Сэфэр і захопіць яго, я дам Ахсу, дачку маю, за
жонку».
17 І здабыў яго Атніэль, сын Кеназа, брата Халева, і [Халеў] даў яму Ахсу, дачку сваю, за жонку.
18 І сталася, што яна прыйшла, і намовіла [мужа], каб той прасіў поля ў бацькі яе. І зьлезла
яна з асла, а Халеў сказаў ёй: «Што табе?»
19 Яна сказала: «Дай мне дабраславенства. Калі ты даў мне зямлю Нэгеў, дай мне крыніцы
водаў». І даў ёй [Халеў] крыніцы верхнія і нізавыя.
20 Гэта спадчына пакаленьня сыноў Юды паводле сем'яў іхніх.
21 Гарады на скраю пакаленьня сыноў Юды каля мяжы Эдому ў Нэгеве: Кабцээль, Эдэр, Ягур,
22 Кіна, Дымона, Адада,
23 Кадэш, Хацор, Ітнан,
24 Зіф, Тэлем, Бэалёт,
25 Хацор-Хадата, Керыёт-Хецрон, значыць Хацор,
26 Амам, Шэма, Малада,
27 Хацор-Гадда, Хешмон, Бэт-Пэлет,
28 Хецар-Шуал, Бээр-Шэва, Бізыётыя,
29 Баала, Іім, Эцэм,
30 Эльталяд, Хесіль, Харма,
31 Цыклаг, Мадмана, Сансана,
32 Лебаот, Шыльхім, Аін і Рымон — усіх гарадоў дваццаць дзевяць і вёскі іхнія.
33 А ў Шэфэлі: Эштаол, Цора, Ашна,
34 Занаах, Эн-Ганнім, Тапуах, Энам,
35 Ярмут, Адулям, Сахо, Азэка,
36 Шааралм, Адытаім, Гедэра і Гедэратаім — усіх гарадоў чатырнаццаць і вёскі іхнія.
37 Цэнан, Хадаша, Мігдаль-Гад,
38 Дылеан, Міцпа, Ёктээль,
39 Ляхіш, Бацкат, Эглён,
40 Каббон, Лахмас, Кітліш,
41 Гедэрот, Бэт-Дагон, Наама, Македа — усіх гарадоў шаснаццаць і вёскі іхнія.
42 Лібна, Этэр, Ашан,
43 Іфтах, Ашна, Нэсіб,
44 Кейла, Ахзіб, Марэша — дзевяць гарадоў і вёскі іхнія.
45 Экрон з навакольнымі гарадамі і вёскамі.
46 І ад Экрону аж да мора — усё, што каля Ашдоду, і вёскі іхнія.
47 Ашдод і гарады ягоныя, і вёскі ягоныя, Газа і гарады ейныя, і вёскі ейныя аж да ручая
Эгіпецкага і Мора Вялікага, і абшар [вакол].
48 А ў гарах: Шамір, Яттыр, Сахо,
49 Данна, Кірыят-Санна або Дэбір,

50 Анаў, Эштэмоа, Анім,
51 Гашэн, Халон, Гілё — адзінаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
52 Араб, Дума, Эшан,
53 Янім, Бэт-Тапуах, Афэка,
54 Хумта, Кірыят-Арба, значыць Хеўрон, Цыор — дзевяць гарадоў і вёскі іхнія.
55 Маон, Кармэль, Зіф, Юта,
56 Езрээль, Ёкдэам, Занаах,
57 Каін, Гіва і Тымна — дзесяць гарадоў і вёскі іхнія.
58 Хальхул, Бэт-Цур, Гедор,
59 Маарат, Бэт-Анот і Эльтэкон — шэсьць гарадоў і вёскі іхнія.
60 Кірыят-Баал, значыць Кірыят-Ярым і Рабба — два гарады і вёскі іхнія.
61 У пустыні: Бэт-Араба, Мідын, Сэхаха,
62 Нібшан, Ір-Гамэлях, Эн- Геды — шэсьць гарадоў і вёскі іхнія.
63 Сыны Юды не маглі аднак выгнаць Евусэяў, якія жылі ў Ерусаліме, і жывуць Евусэі з сынамі Юды ў Ерусаліме да сёньня.

Ег 16

1 Жэрабям [выпала] спадчына сынам Язэпа ад Ярдану насупраць Ерыхону да водаў Ерыхону з усходу; праз пустыню ішла [мяжа] ад Ерыхону па гарах да Бэтэлю.
2 А ад Бэтэлю [мяжа] ішла да Люзу і праходзіла да межаў Аркейцаў у Атароце,
3 і зыходзіла да мора да мяжы Яфлетцаў, і аж да мяжы ніжняга Бэт-Харону, і да Гезэру, і спынялася каля мора.
4 І ўспадкаемілі гэта сыны Язэпа: Манаса і Эфраім.
5 Мяжа сыноў Эфраіма паводле сем'яў іхніх была такая: мяжой спадчыны іхняй на ўсходзе быў Атарот-Адар аж да верхняга Бэт-Харону.
6 І мяжа ішла да мора, да Міхмэтату на поўначы, і паварочвала мяжа на ўсход праз Танат-Шыле і цягнулася на ўсход да Янааху.
7 З Янааху зыходзіла да Атароту і Наары, і праходзіла каля Ерыхону, і спынялася каля Ярдану.
8 З Тапуаху ішла мяжа на захад да ручая Кана і даходзіла да мора. Гэта спадчына пакаленьня Эфраіма паводле сем'яў іхніх.
9 І сыны Эфраіма мелі паасобныя гарады пасярод спадчыны сыноў Манасы, усе гэтыя гарады і вёскі іхнія.
10 Але яны ня выгналі Хананейцаў, якія жылі ў Гезэры. І Хананейцы жывуць сярод Эфраіма да сёньняшняга дня як прыгонныя.

Ег 17

1 І выпала жэрабя пакаленьню Манасы, бо ён быў першародным Язэпа. Махір, першародны Манасы, бацька Гілеада, бо быў ён ваяром, атрымаў Гілеад і Башан.
2 Сваю частку атрымалі астатнія сыны Манасы паводле сем'яў іхніх: сыны Абіезэра, сыны Хэлека, сыны Асрыэля, сыны Шэхэма, сыны Хэфэра і сыны Шэміда. Гэта вось сыны Манасы, сына Язэпа, мужчыны, паводле сем'яў сваіх.
3 А Цэлафхад, сын Хефэра, сына Гілеада, сына Махіра, сына Манасы, ня меў сыноў, а толькі дочкі, якія называліся: Махла, Ноа, Хогля, Мілка і Тырца.
4 І яны прыйшлі перад аблічча Элеазара сьвятара, і Егошуа, сына Нуна, і князёў, і сказалі: «ГОСПАД загадаў Майсею, каб даў нам спадчыну між братоў нашых». І далі ім паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА спадчыну між братоў бацькі іхняга.
5 І меў Манаса дзесяць частак, апрача зямлі Гілеад і Башан за Ярданам,
6 бо дочкі Манасы атрымалі спадчыну між сыноў яго, а зямля Гілеад выпала астатнім сынам Манасы.
7 І была мяжа Манасы ад Асэра да Міхмэтату, які насупраць Сыхему; і мяжа паварочвала ўправа ў бок жыхароў Эн-Тапуаху.

8 Зямлю Тапуаху атрымаў Манаса, а горад Тапуах, які знаходзіцца каля мяжы Манасы,
[належаў] да сыноў Эфраіма.
9 І зыходзіла мяжа да ручая Кана, і на поўдзень ад ручая былі гарады Эфраіма, апроч тых, якія
меў Эфраім сярод гарадоў Манасы, а зямля Манасы была на поўнач ад ручая і цягнулася да
мора.
10 На поўдзень была [зямля] Эфраіма, а на поўнач — Манасы, а мяжой іхняй было мора. З
Асэрам межавалі яны на поўначы, а з Ісахарам — на ўсходзе.
11 Манаса ў межах Ісахара і Асэра [меў] Бэт-Шэан з навакольнымі гарадамі, і Іблеам з
навакольнымі гарадамі, і жыхароў Дору з навакольнымі гарадамі, і жыхароў Эн-Дору з
навакольнымі гарадамі, і жыхароў Таанаху з навакольнымі гарадамі, і жыхароў Мэгіддо з
навакольнымі гарадамі, трэцюю частку Нафату.
12 Але сыны Манасы не маглі авалодаць гарадамі гэтымі, і Хананейцы засталіся ў зямлі гэтай.
13 Калі сыны Ізраіля ўмацаваліся, яны змусілі Хананейцаў да працаў прыгонных, але ня
выгналі іх.
14 І прамовілі сыны Язэпа да Егошуа, кажучы: «Чаму ты даў мне адно толькі жэрабя і адну
толькі частку, хоць я маю такое мноства людзей, бо так дабраславіў мяне ГОСПАД?»
15 І сказаў ім Егошуа: «Калі ты — народ вялікі, займай лес, выкарчуй сабе [абшар] у зямлі
Пэрэзэяў і Рэфаімаў, калі табе на гары Эфраіма зацесна!»
16 І сказалі сыны Язэпа: «Гары нам не хапае, але ўсе Хананейцы, што жывуць у даліне, маюць
калясьніцы жалезныя, як жыхары Бэт-Шэану і навакольных гарадоў, так і ў даліне Езрээль».
17 І сказаў Егошуа дому Язэпа, Эфраіму і Манасе, кажучы: «Ты — народ вялікі і мужны, ня будзе
ў цябе адна толькі частка.
18 Але ты пайдзі на гару і выкарчуй лес, і будуць твае межы ягоныя. І ты выганіш Хананейцаў,
хоць маюць яны калясьніцы жалезныя і хоць яны моцныя».

Ег 18

1 І сабралася ўся грамада сыноў Ізраіля ў Шыло, і там паставілі Намёт Спатканьня, а ўжо ўся
зямля была імі здабытая.
2 І засталіся яшчэ з сыноў Ізраіля сем каленаў, якія не атрымалі спадчыны сваёй.
3 І сказаў Егошуа сынам Ізраіля: «Як доўга вы будзеце марудзіць у тым, каб пайсьці і ўзяць на
ўласнасьць зямлю, якую ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, даў вам?
4 Выбярыце з кожнага калена па тры чалавекі, і я пашлю іх, і яны ўстануць, і абыйдуць зямлю,
і апішуць яе, як разьдзяліць яе ў спадчыну, і прыйдуць да мяне.
5 Разьдзяліце між сабой зямлю на сем частак; Юда няхай застаецца ў межах сваіх на поўдні, а
дом Язэпа застанецца ў межах сваіх на поўначы.
6 А вы падзяліце зямлю на сем частак і прынясіце [апісаньне] сюды да мяне, і я перад абліччам
ГОСПАДА, Бога нашага, кіну дзеля вас жэрабя.
7 Лявіты ня маюць часткі між вамі, бо сьвятарства ГОСПАДА [будзе] спадчынай іхняй. А Гад,
Рубэн і палова калена Манасы атрымалі спадчыну сваю на ўсходнім баку Ярдану, якую даў ім
Майсей, слуга ГОСПАДА».
8 І ўсталі мужчыны, і пайшлі. І загадаў Егошуа тым, якія пайшлі апісваць зямлю, кажучы:
«Абыйдзіце зямлю і апішыце яе, і вярніцеся да мяне, каб тут, у Шыло перад абліччам ГОСПАДА
я кінуў дзеля вас жэрабя».
9 І пайшлі мужчыны, і агледзелі зямлю, і апісалі яе і гарады ейныя ў кнізе, дзелячы на сем
частак. І вярнуліся да Егошуа ў табар у Шыло.
10 І Егошуа кінуў жэрабя перад абліччам ГОСПАДА ў Шыло, і падзяліў там Егошуа зямлю паміж
сынамі Ізраіля паводле частак іхніх.
11 І выпала першае жэрабя на калена сыноў Бэн’яміна паводле сем'яў іхніх. І былі межы часткі
іхняй між сынамі Юды і сынамі Язэпа.
12 Мяжа іхняя на поўначы пачыналася ад Ярдану, і ўзьнімалася на паўночны бок Ерыхону, і
ішла праз горы на захад, і спынялася ў пустыні Бэт-Авэн.

13 Адтуль цягнулася мяжа да Люзу, на поўдзень ад горнага перавалу Люзу або Бэтэлю, і
зыходзіла мяжа да Атарот-Адару праз гару, якая на поўдні ад ніжняга Бэт-Харону.
14 І паварочвала мяжа на захад, і [зыходзіла] на поўдзень ад гары, якая на поўдні перад
Бэт-Харонам, і спынялася пры Кірыят-Баале, гэта Кірыят-Ярым, горад сыноў Юды. Гэта бок
заходні.
15 Паўднёвы бок [пачынаўся] ад скраю Кірыят-Ярыму, і мяжа ішла на захад, і даходзіла да
крыніцы Мэ-Нэфтааху.
16 І зыходзіла мяжа да скраю гары, якая насупраць лагчыны Бэн-Гінном, што на поўначы
даліны Рэфаімаў, і зыходзіла ў лагчыну Гінном праз схіл [гары] Евусэяў на поўдзень, і
даходзіла да Эн-Рагелю,
17 і паварочвала на поўнач, і даходзіла да Эн-Шэмэшу, і ішла да Гэлілоту, які насупраць Маале-
Адумім, і цягнулася да Эвэн-Баган-Бэн-Рэўбэн.
18 І праходзіла мяжа да схілу насупраць Арабы з паўночнага боку, і зыходзіла да Арабы.
19 І праходзіла мяжа на поўнач каля схілу Бэт-Хоглі, і спынялася каля паўночнай затокі Мора
Салёнага, на паўднёвым канцы Ярдану. Гэта мяжа паўднёвая.
20 А Ярдан быў мяжой з усходняга боку. Гэта спадчына сыноў Бэн’яміна і межы ягоныя
навокал паводле сем'яў іхніх.
21 Гарады сыноў Бэн’яміна паводле сем'яў іхніх былі: Ерыхон, Бэт-Хогла, Эмэк-Кецыц,
22 Бэт-Араба, Цэмараім, Бэтэль,
23 Авім, Пара, Офра,
24 Кефар-Амоні, Офні і Геба — дванаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
25 Гібэон, Рама, Бэерот,
26 Міцпа, Кефіра, Моца,
27 Рэкем, Ірпээль, Тараля,
28 Цэля, Элеф, Евус, іначай Ерусалім, Гібэат, Кірыят — чатырнаццаць гарадоў і вёскі іхнія. Гэта
спадчына сыноў Бэн’яміна паводле сем'яў іхніх.

Ег 19

1 Другое жэрабя выпала на пакаленьне сыноў Сымона паводле сем'яў іхніх. І спадчына іхняя
была сярод спадчыны сыноў Юды.
2 І былі ў спадчыне іхняй Бээр-Шэва, Шэва, Малада,
3 Хацар-Шуал, Бала і Эцэм,
4 Эльталяд, Бэтул, Харма,
5 Цыклаг, Бэт-Маркабот, Хацар-Суса,
6 Бэт-Лебаот, Шарухен — трынаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
7 Аін, Рымон, Этэр і Ашан — чатыры гарады і вёскі іхнія.
8 І ўсе вёскі вакол гэтых гарадоў аж да Баалат-Бээру і Рамат-Нэгеву. Гэта спадчына пакаленьня
сыноў Сымона паводле сем'яў іхніх.
9 Частка сыноў Сымона [ўзятая] са спадчыны сыноў Юды, бо частка сыноў Юды была вялікая
для іх, і сыны Сымона атрымалі спадчыну сярод іх.
10 Трэцяе жэрабя выпала на сыноў Завулёна паводле сем'яў іхніх. Мяжа спадчыны іхняй
сягала да Сарыду.
11 Мяжа іхняя ішла да мора, да Марэалу, і даходзіла да Дабэшэту, і аж да ручая, які насупраць
Ёкнэаму.
12 Ад Сарыду паварочвала мяжа на ўсход у бок узыходу сонца аж да мяжы Кіслот-Табору, а
адтуль ішла да Дабэрату і ўзьнімалася да Яфіі.
13 Адтуль мяжа пераходзіла на ўсход, у бок узыходу [сонца], да Гат-Хэфэру і да Эт-Кацыну, і
выходзіла да Рымон-Мэтаару, да Нэі.
14 Далей мяжа ішла на поўнач каля Ханатону і сканчвалася ў даліне Іфтах-Эль.
15 [Таксама] Катат, Нагалал, Шымрон, Ідэала і Бэтлеем — дванаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
16 Гэта спадчына сыноў Завулёна паводле сем'яў іхніх, гарады іхнія і вёскі.

17 Чацьвёртае жэрабя выпала на сыноў Ісахара паводле сем'яў іхніх.
18 І былі ў межах іхніх Езрээль, Кесулот, Шунэм,
19 Хафараім, Шыон, Анахарат,
20 Рабіт, Кішыён, Эбэц,
21 Рэмэт, Эн-Ганім, Эн-Хада, Бэт-Пацэц.
22 І дасягала мяжа да Табору і Шахацымы, і Бэт-Шэмэшу і спынялася на Ярдане — шаснаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
23 Гэта спадчына пакаленьня сыноў Ісахара паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
24 Пятае жэрабя выпала на пакаленьне сыноў Асэра паводле сем'яў іхніх.
25 І былі ў межах іхніх Хэлькат, Халі, Бэтэн і Ахшаф,
26 Алам-Мэлех, Амад і Мішаль, і даходзіла [мяжа] да Кармэлю на захадзе і да Шыхор-Лібнату,
27 і паварочвала на ўсход сонца да Бэт-Дагону, і дасягала Завулёна і лагчыны Іфтах-Эль на поўначы, і [ішла] праз Бэт-Эмэк і Нэель, і выходзіла да Кабулу з паўночнага боку.
28 [Таксама] Эброн, Рэхоў, Хамон і Кана аж да Вялікага Сідону.
29 І заварочвала мяжа да Рамы і аж да ўмацаванага гораду Тыру, і вярталася да Хосы, і спынялася пры моры. [А таксама] Махалеб, Ахзіў,
30 Умма, Афэк і Рэхоў — дваццаць два гарады і вёскі іхнія.
31 Гэта спадчына пакаленьня сыноў Асэра паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
32 Шостае жэрабя выпала на сыноў Нэфталі паводле сем'яў іхніх.
33 Мяжа іхняя ішла з Хэлефа і ад Элён-Бе-Цааннаніму да Адамі-Га-Нэкебу і Ябнээлю, і да Лакуму, і сканчвалася пры Ярдане.
34 І заварочвала мяжа на захад да Азнот-Табору, а адтуль выходзіла на Хукок і датыкалася Завулёна з поўдня, Асэра — з захаду, а Юды — каля Ярдану з усходу.
35 Гарадамі ўмацаванымі ў іх былі Цыддым, Цэр, Хамат, Ракат, Кінэрэт,
36 Адама, Рама, Хацор,
37 Кадэш, Эдрэя, Эн-Хацор,
38 Ірон, Мігдал-Эль, Харэм, Бэт-Анат і Бэт-Шэмэш — дзевятнаццаць гарадоў і вёскі іхнія.
39 Гэта спадчына пакаленьня сыноў Нэфталі паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
40 Сёмае жэрабя выпала на пакаленьне сыноў Дана паводле сем'яў іхніх.
41 Межамі спадчыны іхняй былі Цора, Эштаол, Ір-Шэмэш,
42 Шаалабім, Аялон, Ітла,
43 Элён, Тымна, Экрон,
44 Эльтэке, Гібэтон і Баалат,
45 Егуд, Бэнэ-Бэрак, Гат-Рымон,
46 Мэ-Яркон, Ракон з мяжою каля Яфы.
47 І межы для Дана былі завузкія, і выйшлі сыны Дана, і ваявалі супраць Лешэму, і здабылі яго, і выбілі яго вострывам мяча, і захапілі яго, і абжыліся ў ім, і назвалі яго Лешэм-Дан, ад імя Дана, бацькі свайго.
48 Гэта спадчына пакаленьня сыноў Дана паводле сем'яў іхніх, гарады і вёскі іхнія.
49 І скончылі сыны Ізраіля дзяленьне зямлі, і сыны Ізраіля далі частку Егошуа, сыну Нуна, пасярод сябе.
50 Паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА далі яму горад, і ён зажадаў Тымнат-Сэрах на гары Эфраіма. Ён адбудаваў гэты горад і абжыўся ў ім.
51 Гэта спадчына, якую падзялілі Элеазар сьвятар і Егошуа, сын Нуна, і галовы бацькоў пакаленьняў сыноў Ізраіля, кідаючы жэрабя ў Шыло перад абліччам ГОСПАДА пры ўваходзе ў Намёт Спатканьня. І скончылі падзел зямлі.

Ег 20

1 І прамовіў ГОСПАД да Егошуа, кажучы: «Прамоў да сыноў Ізраіля і скажы ім:
2 “Выдзеліце сабе гарады прыбежышча, пра якія Я гаварыў вам праз Майсея,

3 каб уцякаў у іх той, хто забіў чалавека выпадкова, ненаўмысна, і будуць яны прыбежышчам
ад мсьціўцы за кроў.
4 Калі [забойца] ўцячэ ў адзін з тых гарадоў, няхай ён стане перад брамай гораду і раскажа ў
вушы старшыняў гораду таго справу сваю. І яны возьмуць яго ў горад, і дадуць яму месца на
жыцьцё.
5 Калі мсьціўца за кроў будзе гнацца за ім, яны не аддадуць яго ў рукі ягоныя, бо ён ненаўмысна
забіў бліжняга свайго, і ня меў да яго нянавісьці ані ўчора, ані пазаўчора.
6 І будзе ён жыць у горадзе тым, пакуль ня стане перад грамадой на суд, і пакуль не памрэ
сьвятар вялікі, які будзе ў тыя дні. Тады забойца вернецца ў горад свой, у дом свой, з якога
быў уцёкшы”».
7 І вызначылі Кадэш у Галілеі на гары Нэфталі, Сыхем на гары Эфраіма, і Кірыят-Арбу або
Хеўрон на гары Юды.
8 А на другім баку Ярдану, на ўсход ад Ерыхону, вызначылі Бэцэр у пустыні, на раўніне
пакаленьня Рубэна, Рамот у Гілеадзе, з пакаленьня Гада, і Галян у Башане, з пакаленьня
Манасы.
9 Гэтыя гарады былі выбраныя для ўсіх сыноў Ізраіля і для прыхадня, які жыве сярод іх, каб
мог уцячы туды кожны, хто выпадкова заб’е чалавека, каб не памёр ад рукі мсьціўцы за кроў,
пакуль ня стане перад грамадою [на суд].

Ег 21

1 І прыйшлі галовы бацькоў лявітаў да Элеазара сьвятара і да Егошуа, сына Нуна, і да галоваў
бацькоў пакаленьняў сыноў Ізраіля
2 ў Шыло ў зямлі Ханаан, і прамовілі да іх, кажучы: «Праз Майсея ГОСПАД загадаў, каб далі
нам гарады на пражываньне і пашы для быдла нашага».
3 І сыны Ізраіля далі лявітам са спадчыны сваёй паводле загаду ГОСПАДА гарады і пашы іхнія.
4 І выпала жэрабя для сем'яў Кегата, і атрымалі сыны Аарона сьвятара, лявіты, ад пакаленьняў
Юды, Сымона і Бэн’яміна трынаццаць гарадоў.
5 Астатнія сыны Кегата атрымалі ад пакаленьняў Эфраіма, Дана і паловы пакаленьня Манасы
дзесяць гарадоў.
6 Сынам Гершона жэрабям выпала атрымаць трынаццаць гарадоў ад пакаленьняў Ісахара,
Асэра і Нэфталі і паловы пакаленьня Манасы ў Башане.
7 Сынам Мэрары паводле сем'яў іхніх жэрабям выпала дванаццаць гарадоў ад пакаленьняў
Рубэна, Гада і Завулёна.
8 Сыны Ізраіля далі лявітам, кідаючы жэрабя, гарады гэтыя і пашы іхнія, як загадаў ГОСПАД
праз Майсея.
9 З пакаленьня сыноў Юды і з пакаленьня сыноў Сымона далі гарады, якія названыя паіменна.
10 Сынам Аарона з роду Кегата, сына Левія, бо на іх выпала першае жэрабя,
11 далі Кірыят-Арбу бацькі Анака, значыць Хеўрон, на гары Юды, з навакольнымі палямі.
12 А палі гораду і вёскі ягоныя аддалі на ўласнасьць Халеву, сыну Ефунны.
13 Сынам Аарона сьвятара далі горад прыбежышча для забойцаў Хеўрон і пашы ягоныя, Лібну
і пашы ейныя,
14 Яттыр і пашы ягоныя, Эштэмоа і пашы ягоныя,
15 Халон і пашы ягоныя, Дэбір і пашы ягоныя,
16 Аін, Юту і Бэт-Шэмэш і пашы іхнія — дзевяць гарадоў ад двух пакаленьняў гэтых.
17 Ад пакаленьня Бэн’яміна [далі] Гібэон і пашы ягоныя, Геву і пашы ейныя,
18 Анатот і пашы ягоныя, Альмон і пашы ягоныя — чатыры гарады.
19 Усіх гарадоў для сыноў Аарона сьвятара — трынаццаць гарадоў і пашы іхнія.
20 Для сем'яў сыноў Кегата, лявітаў, астатніх сыноў Кегата, выпала жэрабя на гарады ад
пакаленьня Эфраіма.
21 З пакаленьня Эфраіма далі горад прыбежышча для забойцаў Сыхем і пашы ягоныя на гары
Эфраіма, Гезэр і пашы ягоныя,

22 Кібцаім і пашы ягоныя, Бэт-Харон і пашы ягоныя — чатыры гарады.
23 Ад пакаленьня Дана [далі] Эльтэке і пашы ягоныя, Гібэон і пашы ягоныя,
24 Аялон і пашы ягоныя, Гат-Рымон і пашы ягоныя — чатыры гарады.
25 Ад паловы пакаленьня Манасы [далі] Таанах і пашы ягоныя, Гіт-Рымон і пашы ягоныя — два гарады.
26 Усіх гарадоў з пашамі іхнімі было дадзена дзесяць астатнім сынам Кегата.
27 Для сыноў Гершона з сем'яў Левія [далі] ад паловы пакаленьня Манасы горад прыбежышча для забойцаў Галян у Башане і пашы ягоныя, Аштарот і пашы ягоныя — два гарады.
28 Ад пакаленьня Ісахара [далі] Кішыён і пашы ягоныя, Дабэрат і пашы ягоныя,
29 Ярмут і пашы ягоныя, Эн-Ганім і пашы ягоныя — чатыры гарады.
30 Ад пакаленьня Асэра [далі] Мішэаль і пашы ягоныя, Абдон і пашы ягоныя,
31 Хэлькат і пашы ягоныя, Рэхоў і пашы ягоныя — чатыры гарады.
32 Ад пакаленьня Нэфталі [далі] горад прыбежышча для забойцаў Кадэш у Галілеі і пашы ягоныя, Хамот-Дор і пашы ягоныя, Картан і пашы ягоныя — тры гарады.
33 Усіх гарадоў [сыноў] Гершона паводле сем'яў іхніх — трынаццаць гарадоў і пашы іхнія.
34 Для сем'яў сыноў Мэрары, рэшце лявітаў, [далі] ад пакаленьня Завулёна Ёкнэам і пашы ягоныя, Карту і пашы ягоныя,
35 Дымну і пашы ягоныя, Нагалал і пашы ягоныя — чатыры гарады.
36 Ад пакаленьня Рубэна [далі] Бэцэр і пашы ягоныя, Ягцу і пашы ейныя,
37 Кедэмот і пашы ягоныя, Мэфаат і пашы ягоныя — чатыры гарады.
38 Ад пакаленьня Гада [далі] горад прыбежышча для забойцаў Рамот у Гілеадзе і пашы ягоныя, Маханаім і пашы ягоныя,
39 Хешбон і пашы ягоныя, Язэр і пашы ягоныя — чатыры гарады.
40 Усіх гарадоў сыноў Мэрары паводле сем'яў іхніх, рэшты сем'яў лявітаў, — дванаццаць гарадоў.
41 Усіх гарадоў лявітаў паміж сыноў Ізраіля было сорак восем, і пашы іхнія.
42 І быў кожны горад з пашамі сваімі вакол гораду.
43 Так даў ГОСПАД Ізраілю ўсю зямлю, якую запрысяг даць бацькам іхнім, і яны атрымалі яе на ўласнасьць і абжыліся на ёй.
44 І даў ім ГОСПАД супакой з усіх бакоў, як запрысяг бацькам іхнім, і ніхто з ворагаў іхніх ня мог устаяць супраць іх, і ўсіх ворагаў аддаў ГОСПАД у руку іхнюю.
45 І ніводнае слова добрае, якое прамовіў ГОСПАД дому Ізраіля, не было пустым, але ўсё споўнілася.

Ег 22

1 І паклікаў Егошуа [сыноў] Рубэна, Гада і паловы пакаленьня Манасы,
2 і сказаў ім: «Вы споўнілі ўсё, што вам загадаў Майсей, слуга ГОСПАДА, і слухалі голас мой у-ва ўсім, што я загадаў вам.
3 Вы не пакінулі братоў вашых усе гэтыя дні доўгія аж да сёньняшняга дня, і захавалі выкананьне прыказаньняў ГОСПАДА, Бога вашага.
4 І цяпер даў ГОСПАД, Бог ваш, супакой братам вашым, як абяцаў ім. Цяпер вяртайцеся і ідзіце ў намёты вашыя і ў зямлю ўласнасьці вашай, якую даў вам Майсей, слуга ГОСПАДА, за Ярданам.
5 Толькі пільна намагайцеся выконваць прыказаньні і закон, які загадаў вам Майсей, слуга ГОСПАДА. Любіце ГОСПАДА, Бога вашага, і хадзіце па ўсіх шляхах Ягоных, захоўвайце прыказаньні Ягоныя, туліцеся да Яго і служыце Яму ўсім сэрцам сваім і ўсёю душою сваёю».
6 І дабраславіў іх Егошуа, і адпусьціў іх, і яны вярнуліся ў намёты свае.
7 Адной палове калена Манасы Майсей даў уласнасьць у Башане, а другой палове Егошуа даў уласнасьць між братоў іхніх на заходнім беразе Ярдану. І Егошуа адпусьціў іх у намёты іхнія, і дабраславіў іх,

8 і сказаў ім, кажучы: «Вы вяртаецеся ў намёты свае з багацьцямі вялікімі, з мноствам жывёлы,
срэбрам, золатам, медзьдзю, жалезам і вялікаю колькасьцю адзеньня; падзяліце здабычу з
ворагаў вашых паміж братамі вашымі».
9 І павярнуліся сыны Рубэна, сыны Гада і палова калена Манасы, і пакінулі сыноў Ізраіля
ў Шыло, што ў зямлі Ханаан, каб ісьці ў зямлю Гілеад, у зямлю ўласнасьці сваёй, у якой
пасяліліся паводле [слова] з вуснаў ГОСПАДА праз Майсея.
10 І прыйшлі яны ў ваколіцы Ярдану ў зямлі Ханаан, і пабудавалі каля Ярдану ахвярнік, вялікі
з выгляду.
11 І пачулі сыны Ізраіля, што сыны Рубэна, сыны Гада і палова калена Манасы пабудавалі
ахвярнік каля Ярдану ў зямлі Ханаан на беразе сыноў Ізраіля.
12 І пачулі сыны Ізраіля, і сабралася ўся грамада Ізраіля ў Шыло, каб выйсьці ваяваць супраць
іх.
13 І паслалі сыны Ізраіля да сыноў Рубэна, сыноў Гада і паловы калена Манасы ў зямлю Гілеад
Пінхаса, сына Элеазара сьвятара,
14 а з ім дзесяць князёў, князя з кожнага дому бацькоў, з усіх каленаў Ізраіля, і кожны быў
галавою дому бацькоў сваіх у дружынах Ізраіля.
15 Яны прыйшлі да сыноў Рубэна, сыноў Гада і паловы калена Манасы ў зямлю Гілеад і
прамовілі да іх, кажучы:
16 «Гэта кажа ўся грамада ГОСПАДА: “Што гэта за нявернасьць? Чаму вы няверныя Богу
Ізраіля і пакінулі вы ГОСПАДА, пабудаваўшы сабе ахвярнік і ўзбунтаваўшыся сёньня супраць
ГОСПАДА?
17 Ці мала вам беззаконьня з Пэору, ад якіх не ачысьціліся мы яшчэ да сёньняшняга дня і
прыйшла пляга на грамаду ГОСПАДА?
18 А вы сёньня адступіліся ад ГОСПАДА і паднялі бунт супраць ГОСПАДА, а заўтра ўзгарыцца
гнеў Ягоны на ўсю грамаду Ізраіля.
19 Калі думаеце, што зямля ўласнасьці вашай нячыстая, перайдзіце ў зямлю ўласнасьці
ГОСПАДА, дзе Сяліба ГОСПАДА, і жывіце ў нас. Не бунтуйцеся супраць ГОСПАДА, і нас не
бунтуйце, пабудаваўшы ахвярнік акрамя ахвярніка ГОСПАДА, Бога нашага.
20 Калі Ахан, сын Зэраха, парушыў загад ГОСПАДА адносна заклятага, ці ж гнеў ГОСПАДА
не прыйшоў на ўсю грамаду Ізраіля? Ён адзін [саграшыў], няхай бы ён адзін і памёр за
беззаконьне сваё!”»
21 І адказалі сыны Рубэна, сыны Гада і палова калена Манасы, і прамовілі да начальнікаў
тысячаў Ізраіля:
22 «Бог багоў, ГОСПАД, Бог багоў, ГОСПАД, Ён Сам ведае гэта, і Ізраіль няхай ведае! Калі мы ў
буньце і адступніцтве ад ГОСПАДА [ўчынілі гэта], не пашкадуе Ён нас у сёньняшнім дні.
23 І калі зрабілі мы ахвярнік, каб адступіць ад ГОСПАДА і складаць на ім цэласпаленьні і ахвяры
хлебныя, і ахвяры мірныя, няхай Сам ГОСПАД разьбярэцца.
24 Ці ж не зрабілі мы гэта з руплівасьці і з думкаю, што скажуць заўтра сыны вашыя сынам
нашым: “Што [супольнага] ў вас і ГОСПАДА, Бога Ізраіля?
25 ГОСПАД паставіў на Ярдане мяжу між намі і вамі, сыны Рубэна і сыны Гада, і таму вы ня
маеце ніякай часткі ў ГОСПАДА!” І сыны вашыя адвернуць сыноў нашых ад страху перад
ГОСПАДАМ.
26 І сказалі мы: “Паставім сабе ахвярнік не для цэласпаленьняў і не для ахвяраў крывавых,
27 але як сьведчаньне паміж намі і вамі, і паміж нашчадкамі нашымі, што мы хочам выконваць
службу ГОСПАДА перад абліччам Ягоным праз цэласпаленьні нашыя, ахвяры крывавыя і
ахвяры мірныя”. І ня скажуць заўтра сыны вашыя сынам нашым: “Вы ня маеце часткі ў
ГОСПАДА”.
28 Калі яны так заўтра скажуць нам і нашчадкам нашым, мы скажам: “Вось падабенства
ахвярніка ГОСПАДА, які зрабілі бацькі нашыя не для цэласпаленьняў, не для ахвяраў
крывавых, але каб гэта было сьведчаньнем між намі і вамі”.
29 Далёкія мы, каб бунтавацца супраць ГОСПАДА і адварочвацца, каб не ісьці за Ім,
пабудаваўшы ахвярнік для цэласпаленьняў, ахвяраў хлебных і ахвяраў крывавых, [іншы, чым]

ахвярнік ГОСПАДА, Бога нашага, які перад Сялібай Ягонай».
30 І пачуў сьвятар Пінхас, і князі грамады, і начальнікі дружынаў Ізраіля, якія з ім, гэтыя словы,
што прамовілі сыны Рубэна, сыны Гада і сыны Манасы, і былі яны добрымі ў вачах іхніх.
31 І Пінхас, сын Элеазара сьвятара, сказаў сынам Рубэна, сынам Гада і сынам Манасы:
«Пераканаліся мы сёньня, што сярод вас ГОСПАД, бо вы не дапусьціліся нявернасьці адносна
ГОСПАДА, і захавалі сыноў Ізраіля ад рукі ГОСПАДА!»
32 І Пінхас, сын Элеазара сьвятара, і князі вярнуліся ад сыноў Рубэна і сыноў Гада з зямлі Гілеад
у зямлю Ханаан, да сыноў Ізраіля, якім прынесьлі словы гэтыя.
33 І справа гэтая была добрай у вачах сыноў Ізраіля, і дабраславілі Бога сыны Ізраіля, і не
гаварылі больш, каб ісьці супраць іх ваяваць, каб спустошыць зямлю, абжытую сынамі Рубэна
і сынамі Гада.
34 А сыны Рубэна і сыны Гада клікалі над ахвярнікам: «Гэта сьведка між намі, што ГОСПАД
ёсьць Бог».

Ег 23

1 І сталася, калі мінула шмат дзён пасьля таго, як ГОСПАД даў Ізраілю супакой ад усіх ворагаў
іхніх навокал, і Егошуа быў стары і меў шмат дзён,
2 склікаў Егошуа ўвесь Ізраіль, і старшыняў, і князёў, і судзьдзяў, і начальнікаў, і сказаў ім: «Я
састарэў і маю шмат дзён,
3 а вы бачылі ўсё, што зрабіў ГОСПАД, Бог ваш, усім гэтым народам перад абліччам вашым, бо
ГОСПАД, Бог ваш, ваяваў за вас.
4 Глядзіце, я падзяліў між вас жэрабям як спадчыну для каленаў вашых тыя народы, якія
засталіся за Ярданам, і ўсе народы, якія я вынішчыў да Мора Вялікага на захадзе.
5 ГОСПАД, Бог ваш, разгоніць іх перад абліччам вашым і прыбярэ іх перад абліччам вашым, і
вы паселіцеся на зямлі іхняй, як ГОСПАД, Бог ваш, прамовіў вам.
6 Будзьце вельмі цьвёрдымі, і захоўвайце, і выконвайце ўсё, што напісана ў кнізе Закону
Майсея, і не адхіляйцеся ад яго ані ўправа, ані ўлева.
7 І не сябруйце з тымі народамі, якія між вамі засталіся, і ня ўзгадвайце імёны багоў іхніх, і не
прысягайце імі, і не служыце ім, і не пакланяйцеся ім,
8 але туліцеся толькі да ГОСПАДА, Бога вашага, як рабілі вы да гэтага дня.
9 І выгнаў ГОСПАД перад абліччам вашым народы вялікія і моцныя, і ніводзін з іх ня мог вам
супрацівіцца да дня гэтага.
10 Адзін з вас гнаў тысячу [ворагаў], бо ГОСПАД, Бог ваш, Сам ваяваў за вас, як Ён прамовіў да
вас.
11 Пільна намагайцеся душамі вашымі, каб любіць ГОСПАДА, Бога вашага.
12 Бо калі вы адвернецеся [ад Яго] і будзеце сябраваць і мяшацца сужонствамі з гэтымі
народамі, якія сярод вас засталіся,
13 ведайце, што ГОСПАД, Бог ваш, ня будзе выгоняць іх перад абліччам вашым, але яны стануць
вам сеткаю, і пасткаю, і бічом для вас, і калючкаю ў вачах вашых, аж пакуль ня вынішчыць Ён
вас з гэтай добрай зямлі, якую даў вам ГОСПАД, Бог ваш.
14 І вось сёньня я ўзыходжу на дарогу ўсёй зямлі. А вы ведайце ўсім сэрцам сваім і ўсёю душою
сваёй, што з усіх словаў добрых, якія прамаўляў да вас ГОСПАД, Бог ваш, ніводнае не было
пустое, але ўсё споўнілася.
15 Але як спраўдзілася перад вамі ўсякае добрае слова, якое прамаўляў да вас ГОСПАД, Бог ваш,
так навядзе ГОСПАД на вас усе тыя ліхія словы, пакуль ня вынішчыць вас з гэтай добрай зямлі,
якую даў вам ГОСПАД, Бог ваш.
16 Калі вы парушыце запавет ГОСПАДА, Бога вашага, які Ён загадаў вам, і пойдзеце, і будзеце
служыць багам іншым, і пакланяцца ім, тады запалае супраць вас гнеў ГОСПАДА і хутка вы
загінеце на гэтай добрай зямлі, якую Ён вам даў».

Ег 24

1 І сабраў Егошуа ў Сыхеме ўсе калены Ізраіля, і паклікаў старшыняў Ізраіля, і князёў, і
судзьдзяў, і начальнікаў, і яны сталі перад абліччам Бога.
2 І сказаў Егошуа да ўсяго народу: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “За ракою жылі бацькі
вашыя спрадвеку, Тэрах, бацька Абрагама і бацька Нахора, і служылі іншым багам.
3 І ўзяў Я бацьку вашага, Абрагама, з другога боку ракі, і правёў яго праз усю зямлю Ханаан, і
памножыў насеньне ягонае, і даў яму Ісаака.
4 І даў Я Ісааку Якуба і Эзава, і Эзаву Я даў гару Сэір на ўласнасьць, а Якуб і сыны ягоныя зыйшлі
ў Эгіпет.
5 І паслаў Я туды Майсея і Аарона, і ўдарыў Эгіпет [плягамі], якія Я рабіў у ім, а пасьля Я вывеў
вас.
6 І Я вывеў бацькоў вашых з Эгіпту, і прыйшлі вы да мора. І гналіся за бацькамі вашымі Эгіпцяне
з калясьніцамі і коньнікамі аж да Мора Чырвонага.
7 І клікалі вы да ГОСПАДА, і Ён паставіў цемру паміж вамі і Эгіпцянамі, і напусьціў на іх мора,
і яно пахавала іх, і бачылі вочы вашыя, што Я зрабіў у Эгіпце. І жылі вы шмат дзён у пустыні.
8 І ўвёў Я вас у зямлю Амарэйцаў, якія жылі на тым баку Ярдану, і яны ваявалі супраць вас, і Я
выдаў іх у рукі вашыя, і занялі вы зямлю іхнюю, і выбілі іх.
9 І паўстаў Балак, сын Цыпора, валадар Мааву, і ваяваў супраць Ізраіля. Ён паслаў і паклікаў
Білеама, сына Бэора, каб ён праклінаў вас.
10 Але Я не захацеў слухаць Білеама, але, дабраслаўляючы, дабраславіў вас, і вызваліў вас з
рук ягоных.
11 І пераправіліся вы праз Ярдан, і прыйшлі ў Ерыхон. І ваявалі супраць вас гаспадары Ерыхону,
Амарэйцы, Пэрэзэі і Хананейцы, Хеты, Гіргашэі, Хівеі і Евусэі, але Я выдаў іх у рукі вашыя.
12 І паслаў Я перад абліччам вашым шаршанёў, і яны выгналі іх перад вамі, двух валадароў
Амарэйскіх, не мячом тваім і ня лукам тваім.
13 І даў Я вам зямлю, над якой вы не працавалі, і гарады, якіх вы не будавалі, і вы жывіцё ў іх,
і вінаград, і аліўкавыя дрэвы, якіх вы не садзілі, а вы жывіцеся імі”.
14 І цяпер бойцеся ГОСПАДА і служыце Яму ў шчырасьці і праўдзе. Выкіньце багоў, якім
служылі бацькі вашыя на другім баку ракі і ў Эгіпце, і служыце ГОСПАДУ!
15 А калі нядобра ў вачах вашых служыць ГОСПАДУ, выбірайце сабе сёньня, каму будзеце
служыць: ці багам, якім служылі бацькі вашыя на другім баку ракі, ці багам Амарэйцаў, у
зямлі якіх вы жывіцё. А я і дом мой будзем служыць ГОСПАДУ».
16 І адказаў народ, і сказаў: «Ня будзе так, каб мы пакінулі ГОСПАДА, каб служыць чужым
багам.
17 Бо ГОСПАД, Бог наш, вывеў нас і бацькоў нашых з зямлі Эгіпецкай, з дому няволі, і Ён учыніў
на вачах нашых знакі вялікія, і Ён захоўваў нас на ўсім шляху, якім мы вандравалі, і сярод усіх
народаў, праз якія мы праходзілі.
18 І выгнаў ГОСПАД перад намі ўсе народы і Амарэйцаў, жыхароў зямлі гэтай, і мы будзем
таксама служыць ГОСПАДУ, бо Ён — Бог наш!»
19 І сказаў Егошуа народу: «Вы ня здолееце служыць ГОСПАДУ, бо Ён — Бог сьвяты і Бог
зайздросны, і Ён не прабачыць вам бунту вашага і грахоў вашых.
20 Калі вы пакінеце ГОСПАДА і будзеце служыць багам чужым, Ён прыйдзе да вас, і будзе караць
вас, і выгубіць вас так, як раней рабіў дабро вам».
21 І сказаў народ Егошуа: «Ня [будзе так], але мы будзем служыць ГОСПАДУ».
22 І Егошуа сказаў народу: «Вы самі — сьведкі супраць сябе, бо вы самі выбралі сабе ГОСПАДА,
каб служыць Яму». Яны сказалі: «Мы — сьведкі».
23 І Егошуа сказаў: «Цяпер выкіньце багоў чужых, якія сярод вас, і прыхіліце сэрцы вашыя да
ГОСПАДА, Бога Ізраіля».
24 І народ сказаў Егошуа: «ГОСПАДУ, Богу нашаму, будзем служыць, голас Ягоны будзем
слухаць».
25 І заключыў Егошуа ў гэты дзень запавет з народам, і даў яму пастановы і прысуды ў Сыхеме.

26 І запісаў Егошуа словы гэтыя ў кнізе Закону Божага. І ўзяў ён камень вялікі, і паставіў яго
там пад дубам, які ў сьвятыні ГОСПАДА.
27 І сказаў Егошуа ўсяму народу: «Вось, гэты камень будзе супраць вас як сьведка, бо ён чуў
усе словы ГОСПАДА, якія ГОСПАД гаварыў да нас, і ён будзе сьведкам супраць вас, каб вы не
адракліся Бога вашага».
28 І адпусьціў Егошуа народ, і кожны пайшоў у спадчыну сваю.
29 Пасьля ўсяго гэтага памёр Егошуа, сын Нуна, слуга ГОСПАДА, [маючы] сто дзесяць гадоў.
30 І пахавалі яго ў межах спадчыны ягонай у Тымнат-Сэраху, што на гары Эфраіма, на поўнач
ад гары Гааш.
31 І служыў Ізраіль ГОСПАДУ ўсе дні Егошуа і ўсе дні старшыняў, якія перажылі Егошуа і ведалі
ўсё, што ГОСПАД зрабіў Ізраілю.
32 А косткі Язэпа, якія сыны Ізраіля забралі з сабой з Эгіпту, пахавалі ў Сыхеме, на частцы поля,
якое купіў Якуб у сыноў Гамора, бацькі Сыхема, за сто кесітаў, і сталася яно спадчынай сыноў
Язэпа.
33 І памёр Элеазар, сын Аарона, і пахавалі яго на ўзгорку Пінхаса, сына ягонага, які быў да-
дзены яму на гары Эфраіма.

КНІГА СУДЗЬДЗЯЎ

1 Пасьля сьмерці Егошуа пыталіся сыны Ізраіля ў ГОСПАДА, кажучы: «Хто з нас першы
выступіць супраць Хананейцаў ваяваць з імі?»
2 ГОСПАД адказаў ім: «Няхай выступіць Юда, бо Я аддаў зямлю гэтую ў рукі ягоныя».
3 І сказаў Юда Сымону, брату свайму: «Увайдзі са мной у жэрабя маё і будзем разам ваяваць
супраць Хананейцаў, а я ўвайду з табой у жэрабя тваё». І пайшоў з ім Сымон.
4 І пайшоў Юда, і аддаў ГОСПАД у рукі іхнія Хананейцаў і Пэрэзэяў, і ў Бэзэку выбілі яны дзесяць
тысячаў мужчын.
5 У Бэзэку сустрэліся яны з Адоні-Бэзэкам і ваявалі з ім, і перамаглі Хананейцаў і Пэрэзэяў.
6 І Адоні-Бэзэк уцёк, але яны дагналі яго, і схапілі, і адрэзалі вялікія пальцы на руках і нагах
ягоных.
7 І сказаў Адоні-Бэзэк: «Семдзясят валадароў з адрэзанымі вялікімі пальцамі на руках і нагах
зьбіралі крошкі пад сталом маім. І як я рабіў, так і мне Бог адплаціў». І завялі яго ў Ерусалім,
і там ён памёр.
8 І ваявалі сыны Юды з Ерусалімам, і захапілі яго, і выбілі яго вострывам мяча, а горад спалілі
агнём.
9 Потым зыйшлі сыны Юды і ваявалі супраць Хананейцаў, якія жылі ў гарах, у Нэгеве і ў
Шэфэлі.
10 І пайшоў Юда супраць Хананейцаў, якія жылі ў Хеўроне, што раней называўся Кірыят-Арба,
і пабіў Шэшая, Ахімана і Тальмая.
11 Адтуль пайшоў ён супраць жыхароў Дэбіру, які раней называўся Кірыят-Сэфэр.
12 І сказаў Халеў: «Хто нападзе на Кірыят-Сэфэр і здабудзе яго, таму дам за жонку Ахсу, дачку
маю».
13 І здабыў яго Атніэль, сын Кеназа, малодшага брата Халева, і Халеў аддаў яму за жонку Ахсу,
дачку сваю.
14 Калі яна прыйшла, ён намовіў яе, каб прасіла ў бацькі свайго поля. І калі яна зьлезла з асла,
сказаў ёй Халеў: «Што табе?»
15 А яна адказала: «Дай мне дабраславенства, бо даў ты мне зямлю Нэгеў. Дай мне крыніцы
водаў». І даў ёй Халеў крыніцы верхнія і крыніцы нізавыя.
16 Сыны Кенэя, цесьця Майсея, выйшлі з гораду Пальмаў з сынамі Юды ў пустыню Юды, якая
на поўдзень ад Араду, і там абжыліся з народам.
17 І пайшоў Юда з братам сваім Сымонам, і разам напалі яны на Хананейцаў, якія жылі ў
Цэфаце, і аблажылі іх закляцьцем, і назвалі горад гэты Харма.
18 І Юда здабыў Газу і ваколіцы ейныя, Ашкелён і ваколіцы ягоныя, Экрон і ваколіцы ягоныя.
19 І ГОСПАД быў з Юдам, і ён захапіў горы, але ня мог выгнаць жыхароў даліны, бо мелі яны
калясьніцы жалезныя.
20 Халеву аддалі Хеўрон, як сказаў Майсей, і выгнаў ён адтуль трох сыноў Анака.
21 А сыны Бэн’яміна ня выгналі з Ерусаліму жыхароў ягоных, Евусэяў; і жывуць Евусэі па
сёньняшні дзень разам з сынамі Бэн’яміна ў Ерусаліме.
22 Таксама дом Язэпа пайшоў ў Бэтэль, і ГОСПАД быў з імі.
23 І дом Язэпа выведваў Бэтэль, што раней называўся Люз,
24 і ўбачылі выведчыкі чалавека, які выходзіў з гораду, і сказалі яму: «Пакажы нам уваход у
горад, і мы зьявім табе міласэрнасьць».
25 І ён паказаў ім уваход у горад, яны выбілі горад вострывам мяча, а чалавека таго і ўсю сям'ю
ягоную адпусьцілі.
26 І чалавек той пайшоў у зямлю Хетаў, і заснаваў там горад, і назваў яго Люз, які гэтак
называецца па сёньняшні дзень.
27 А Манаса не здабыў Бет-Шэан і Таанах з ваколіцамі іхнімі, і жыхароў Дору, і Іблеаму, і
Мэгіддо з ваколіцамі іхнімі, і засталіся Хананейцы жыць на гэтай зямлі.

28 А калі Ізраільцяне ўмацаваліся, яны зрабілі Хананейцаў прыгоннымі, але іх ня выгналі.
29 І Эфраім ня выгнаў Хананейцаў, што жылі ў Гезэры, і Хананейцы жылі сярод іх у Гезэры.
30 І Завулён ня выгнаў жыхароў Кітрону і Нагалалу, і Хананейцы жылі між іх, і сталіся ў іх прыгоннымі.
31 Асэр ня выгнаў жыхароў Акко, Сідону, Ахлябу, Ахзібу, Гэльбы, Афэка і Рэхову.
32 І жыў Асэр сярод Хананейцаў, жыхароў той зямлі, бо ня выгнаў іх.
33 Нэфталі ня выгнаў жыхароў Бэт-Шэмешу і Бэт-Анату, і жыў між Хананейцаў, жыхароў зямлі гэтай, і жыхары Бэт-Шэмешу і Бэт-Анату былі ў яго прыгоннымі.
34 І выпхнулі Амарэйцы сыноў Дана ў горы, і не далі ім зыйсьці ў даліну.
35 Амарэйцы жылі ў Гар-Хэрэсе, у Аялоне і ў Шаальбіме. І цяжэла над імі рука дому Язэпа, і яны былі ў яго прыгоннымі.
36 А межы Амарэйцаў цягнуліся ад узвышша Акраббім і да Сэлі і вышэй.

Суд 2

1 І зыйшоў анёл ГОСПАДА з Гільгалу ў Бахім, і сказаў: «Я вывеў вас з Эгіпту і завёў вас у зямлю, якую Я запрысяг бацькам вашым, і сказаў: “Не парушу запавету Майго з вамі на вякі.
2 Не заключайце запавет з жыхарамі зямлі гэтай, але разваліце ахвярнікі іхнія”. Але вы не захацелі паслухаць голасу Майго. Чаму вы гэтак зрабілі?
3 І Я сказаў: “Ня буду выганяць іх перад абліччам вашым, каб былі яны вам цернем, а богі іхнія будуць для вас пасткаю”».
4 Калі анёл ГОСПАДА прамаўляў словы гэтыя да ўсіх сыноў Ізраіля, яны ўзьнялі голас свой і заплакалі.
5 І назвалі імя месцу гэтаму Бахім, і яны там склалі ахвяру ГОСПАДУ.
6 І адпусьціў Егошуа народ, і пайшлі сыны Ізраіля, кожны ў спадчыну сваю, каб узяць на ўласнасьць зямлю.
7 І служылі яны ГОСПАДУ ў-ва ўсе дні Егошуа і старшыняў, якія жылі пасьля Егошуа і бачылі ўсе вялікія дзеяньні ГОСПАДА, якія ўчыніў Ён для Ізраіля.
8 І памёр Егошуа, сын Нуна, слуга ГОСПАДА, маючы сто дзесяць гадоў.
9 І пахавалі яго ў межах спадчыны ягонай у Тымнат-Хэрэсе на гары Эфраіма, на поўнач ад гары Гааш.
10 І калі ўсё тое пакаленьне адыйшло да бацькоў сваіх, паўстала іншае пакаленьне пасьля іх, якое ня ведала ГОСПАДА і таго, што Ён зрабіў для Ізраіля.
11 І чынілі сыны Ізраіля ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і служылі Баалам.
12 І пакінулі яны ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, Які вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, і пайшлі за багамі чужымі, за багамі народаў, якія жылі вакол іх, і пакланяліся ім, і гнявілі ГОСПАДА.
13 І яны пакінулі ГОСПАДА, і служылі Баалу і Астарце.
14 І разгневаўся ГОСПАД на Ізраіля, і аддаў іх у рукі рабаўнікоў, якія зрабавалі ахвярнікі іхнія, і аддаў іх у рукі ворагаў, якія жылі вакол, і яны ўжо не маглі супрацівіцца ворагам сваім.
15 І ў-ва ўсім, што яны рабілі, рука ГОСПАДА была ім на зло, як ГОСПАД казаў і як ГОСПАД прысягаў. І былі яны ў вялікім уціску.
16 І паставіў ім ГОСПАД судзьдзяў, каб яны ратавалі іх ад рукі крыўдзіцеляў іхніх.
17 Але яны і судзьдзяў сваіх ня слухалі, і паганіліся з багамі чужымі, і ім пакланяліся. Хутка збочвалі яны з дарогі, якою ішлі бацькі іхнія, якія слухалі прыказаньні ГОСПАДА. А яны рабілі насуперак.
18 Калі ГОСПАД даваў ім судзьдзяў, ГОСПАД быў з судзьдзёю і ратаваў іх ад рук ворагаў іхніх у-ва ўсе дні судзьдзі, бо ГОСПАД літаваўся над імі, калі яны стагналі ад тых, што іх уціскалі і перасьледавалі.
19 Калі ж паміраў судзьдзя, яны адварочваліся і дапускаліся горшых злачынстваў, чым бацькі іхнія, ідучы за багамі чужымі, служачы ім і пакланяючыся ім, не пакідалі яны ўчынкаў сваіх ліхіх і шляху свайго ліхога.

20 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА на Ізраіля, і Ён сказаў: «За тое, што народ гэты парушыў запавет
Мой, які Я заключыў з бацькамі іхнімі, і яны ня слухалі голас Мой,
21 Я ня выганю перад абліччам іхнім народы, якіх пакінуў Егошуа, калі памёр,
22 каб праз іх выспрабаваць Ізраіля, ці будуць яны захоўваць шлях ГОСПАДА і хадзіць па ім, як
захоўвалі бацькі іхнія, ці не?»
23 І пакінуў ГОСПАД народы гэтыя, і ня выгнаў іх хутка, і не аддаў іх у рукі Егошуа.

Суд 3

1 Гэта народы, якія ГОСПАД пакінуў, каб праз іх выспрабаваць Ізраіля, усіх, якія ня ведалі ўсіх
войнаў з Хананейцамі,
2 каб навучыліся наступныя пакаленьні сыноў Ізраіля змагацца з ворагамі, бо яны ня ведалі
войнаў:
3 пяць валадароў Філістынскіх, і ўсе Хананейцы, Сідонцы і Хівеі, што жылі ў гарах Лібану, ад
гары Баал-Гермон аж да ўваходу ў Хамат.
4 Засталіся яны, каб праз іх выспрабаваць Ізраіля, ці будзе ён слухацца прыказаньняў
ГОСПАДА, якія загадаў Ён бацькам іхнім праз Майсея.
5 І сыны Ізраіля жылі паміж Хананейцаў, Хетаў, Амарэйцаў, Пэрэзэяў, Хівеяў і Евусэяў.
6 І бралі яны за жонак дачок іхніх, і дочкі свае аддавалі сынам іхнім, і служылі багам іхнім.
7 І чынілі сыны Ізраіля ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і забыліся пра ГОСПАДА, Бога свайго, служачы
Баалу і Астарце.
8 І разгневаўся ГОСПАД на Ізраіля, і аддаў іх у рукі Кушан-Рышатаіма, валадара Арам-
Нагараіму, і служылі сыны Ізраіля яму восем гадоў.
9 І клікалі сыны Ізраіля ГОСПАДА, і ГОСПАД паставіў ім збаўцу з сыноў Ізраіля, і выратаваў іх
Атніэль, сын Кеназа, малодшы брат Халева.
10 І быў на ім Дух ГОСПАДА, і судзіў ён Ізраіля. І ваяваў ён, і аддаў ГОСПАД у рукі ягоныя Кушан-
Рышатаіма, валадара Арам-Нагараіму, і перамагла рука ягоная Кушан-Рышатаіма.
11 І адпачывала зямля сорак гадоў. І памёр Атніэль, сын Кеназа.
12 І сыны Ізраіля ізноў пачалі чыніць ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і Ён умацаваў супраць іх Эглона,
валадара Мааву, за ліхоту, якой дапускаліся яны ў вачах ГОСПАДА.
13 І далучыў Эглон да сябе сыноў Амона і сыноў Амалека, і пайшоў, і захапіў Ізраіль, і заняў
горад Пальмаў.
14 І сыны Ізраіля служылі Эглону, валадару Мааву, васемнаццаць гадоў.
15 І клікалі сыны Ізраіля ГОСПАДА, і Ён даў ім збаўцу Эгуда, сына Гера, сына Бэн'яміна,
які замест правай [карыстаўся левай] рукой. І сыны Ізраіля паслалі праз яго дары Эглону,
валадару Мааву.
16 Эгуд зрабіў сабе меч двусечны, даўжынёю ў локаць, і схаваў яго пад адзеньнем сваім на
правым баку.
17 І склаў ён падарункі Эглону, валадару Мааву. Эглон жа быў вельмі тоўсты.
18 Калі [Эгуд] даў яму дары, адпусьціў людзей, якія іх прынесьлі,
19 і, вярнуўшыся з Гільгалу, дзе былі ідалы, сказаў [валадару]: «Валадару, маю для цябе
таемнае слова». Той загадаў маўчаць, і выйшлі ўсе, якія пры ім былі.
20 Эгуд падыйшоў да яго; а той сядзеў у летнім пакоі, які займаў сам. Эгуд сказаў: «Слова ад
Бога маю сказаць табе». Той падняўся з пасаду.
21 Тады Эгуд выцягнуў левую руку, і схапіў меч на правым баку сваім, і пырнуў ім у жывот
ягоны,
22 і чарано ўвайшло ў нутро і засела ў тлушчы; і [Эгуд] ня выцягнуў меч з жывата ягонага, і
пакінуў яго.
23 І выйшаў Эгуд праз ганак, і замкнуў за сабою дзьверы пакоя на рыгель.
24 І ён выйшаў, і прыйшлі слугі [валадара], і калі ўбачылі замкнутыя дзьверы пакоя, сказалі:
«Напэўна, накрыў ногі свае ў летнім пакоі».

25 І чакалі доўга, аж стрывожыліся, і ніхто не адчыняў дзьверы летняга пакою, і ўзялі ключы,
і адчынілі, і вось, гаспадар іхні, які ляжаў на зямлі мёртвы.
26 Пакуль яны чакалі, Эгуд уцёк, і прайшоўшы каля ідалаў, прыйшоў у Цэйрату.
27 І прыйшоў, і затрубіў у рог на гары Эфраіма. І сыны Ізраіля зыйшлі з ім з гары, і ён ішоў на
чале іх.
28 І сказаў ён ім: «Хадземце за мною, бо ГОСПАД выдаў ворагаў вашых, Мааўлянаў, у рукі
вашыя». Яны пайшлі за ім, і занялі броды на Ярдане, якімі пераходзяць у Мааў, і не дазволілі
нікому перайсьці.
29 І ў гэты час выбілі яны каля дзесяці тысячаў Мааўлянаў, а былі яны ўсе дужыя і моцныя. І
ніводзін з іх ня ўцёк.
30 І ўпакораныя былі ў той дзень Мааўляне рукою Ізраіля, і восемдзясят гадоў зямля жыла
спакойна.
31 Пасьля яго быў Шамгар, сын Аната. Ён пабіў Філістынцаў шэсьцьсот чалавек кіем для быдла.
Ён таксама збавіў Ізраіля.

Суд 4

1 Пасьля сьмерці Эгуда сыны Ізраіля зноў пачалі рабіць ліхое ў вачах ГОСПАДА.
2 І аддаў іх ГОСПАД у рукі Явіна, валадара Ханаану, які валадарыў у Хацоры. Начальнікам
войска ягонага быў Сісэра, які жыў у Харашэт-Гагаіме.
3 І клікалі сыны Ізраіля да ГОСПАДА, бо Явін меў дзевяцьсот калясьніцаў жалезных і дваццаць
гадоў бязьлітасна ўціскаў сыноў Ізраіля.
4 У гэты час судзіла Ізраіль Дэбора прарочыца, жонка Ляпідота.
5 Яна сядзела пад пальмаю Дэборы паміж Рамаю і Бэтэлем на гары Эфраіма. І прыходзілі да
яе сыны Ізраіля на суд.
6 Яна паслала і паклікала Барака, сына Абінаама, з Кадэш-Нэфталі, і сказала яму: «Гэта загадаў
ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Ідзі і вядзі войска на гару Табор, і вазьмі з сабою дзесяць тысячаў ваяроў
з сыноў Нэфталі і з сыноў Завулёна.
7 А Я прывяду да цябе да ручая Кішон Сісэру, начальніка войска Явіна, і калясьніцы ягоныя, і
ўсё мноства ягонае, і аддам яго ў рукі твае”».
8 І сказаў ёй Барак: «Калі ты пойдзеш са мною, і я пайду, а калі ня пойдзеш са мной, я не
пайду».
9 Яна сказала: «Я пайду з табою, але ў гэтай выправе ты не здабудзеш славы, бо ў рукі жынчыны
аддасьць ГОСПАД Сісэру». І ўстала Дэбора, і пайшла з Баракам у Кадэш.
10 А Барак сабраў сыноў Завулёна і Нэфталі ў Кадэшы, і вырушыў з дзесяцьцю тысячамі ваяроў,
і пайшла з імі Дэбора.
11 А Хэвэр Кенэянін аддзяліўся ад іншых сыноў Кенэя, братоў сваіх, сыноў Хавава, цесьця
Майсея, і разлажыўся табарам каля дуба ў Цааананіме каля Кадэшу.
12 І даведаўся Сісэра, што Барак, сын Абінаама, вырушыў на гару Табор.
13 І сабраў Сісэра ўсе калясьніцы свае, дзевяцьсот калясьніцаў жалезных, і ўсе дружыны свае,
якія меў, і загадаў ім прыйсьці з Харашэт-Гагаіму да ручая Кішон.
14 І сказала Дэбора Бараку: «Устань, бо ў гэты дзень аддасьць ГОСПАД у рукі твае Сісэру. Сам
ГОСПАД пойдзе перад табою». І зыйшоў Барак з гары Табор, і разам з ім дзесяць тысячаў
ваяроў.
15 Тады ГОСПАД навёў жах на Сісэру і на ўсе калясьніцы ягоныя, і на ўсё мноства войска ягонага
перад вострывам мяча Барака. І сам Сісэра выскачыў з калясьніцы, і ўцякаў пешшу.
16 А Барак гнаў калясьніцы і войска аж да Харашэт-Гагаіму. І ўсё войска Сісэры загінула ад
вострыва мяча, і ніводзін не ацалеў.
17 А Сісэра ўцякаў пешшу і прыбег да намёту Яэлі, жонкі Хэвэра Кенэяніна. Бо быў мір між
Явінам, валадаром Хацору, і домам Хэвэра Кенэяніна.
18 І Яэль выйшла з намёту на спатканьне Сісэры, і сказала яму: «Увайдзі да мяне, пане мой,
увайдзі, ня бойся». Ён увайшоў у намёт яе, і яна накрыла яго кілімам.

19 Ён сказаў ёй: «Дай мне, калі ласка, крыху вады, бо я вельмі засьмягшы». Яна адкрыла буклак
з малаком і дала яму напіцца, а потым зноў накрыла яго.
20 [Сісэра] сказаў ёй: «Пастой каля ўваходу ў намёт, і калі хто прыйдзе і будзе пытацца ў цябе:
“Ці ёсьць тут хто?”, ты адкажы: “Нікога няма”».
21 Тады Яэль, жонка Хэвэра, узяла калок ад намёту і молат, і ўвайшла ціха да яго, і прабіла яго
скроні калком, і [Сісэра] ўткнуўся ў зямлю, а ён спаў ад зьнямогі, і памёр.
22 І вось Барак, гонячыся за Сісэрам, надыйшоў. Яэль выйшла да яго і сказала: «Хадзем, я
пакажу табе чалавека, якога ты шукаеш». Ён, калі ўвайшоў да яе, убачыў Сісэру, што ляжаў
мёртвы, з калком у скронях.
23 У той дзень прынізіў Бог Явіна, валадара Ханаану, перад абліччам сыноў Ізраіля.
24 І мацнела рука сыноў Ізраіля, і цяжэла рука іхняя над Явінам, валадаром Ханаану, пакуль
яны ня зьнішчылі Явіна, валадара Ханаану.

Суд 5

1 У той дзень засьпявалі Дэбора і Барак, сын Абінаама, кажучы:
2 «Адпомшчаны Ізраіль, бо народ выступіў дабраахвотна! Дабраславіце ГОСПАДА!
3 Слухайце, валадары, прыхіліце вушы, начальнікі. Я ГОСПАДУ буду сьпяваць, буду граць
хвалу ГОСПАДУ, Богу Ізраіля!
4 ГОСПАДЗЕ, калі Ты выходзіў з Сэіру, калі Ты выходзіў з ваколіцаў Эдому, тады трэслася зямля,
і неба плакала, і хмары лілі [кроплі] вады.
5 Горы таялі перад абліччам ГОСПАДА з Сынаю, перад абліччам ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
6 У дні Шамгара, сына Аната, у дні Яэлі апусьцелі дарогі; а тыя, што хадзілі па іх, абыходзілі іх
сьцежкамі бочнымі.
7 Зьніклі мужныя ў Ізраілі, іх ня стала, пакуль не паўстала я, Дэбора, і паднялася як маці ў
Ізраілі.
8 Выбралі яны сабе багоў новых, і тады [прыйшла] вайна ў брамы, але не відаць ані шчыта, ані
дзіды ў сарака тысячаў Ізраіля.
9 Сэрца маё [зьвяртаецца] да князёў Ізраіля, якія дабраахвотна ахвяраваліся за народ,
дабраславіце ГОСПАДА!
10 Вы, што едзеце на асьліцах белых, і вы, што сядзіце на кілімах і вы, што ідзіцё дарогамі,
сьпявайце!
11 Галасы тых, якія дзеляць [здабычу] пры вадапоях, няхай расказваюць пра праведнасьць
ГОСПАДА, пра праведнасьць магуцьця Яго ў Ізраілі; тады зьбярэцца народ ГОСПАДА каля
брамаў.
12 Устань, устань, Дэбора! Устань, устань і засьпявай сьпеў! Устань, Барак, вазьмі палонных
тваіх, сын Абінаама!
13 Тады запануе рэшта правадыроў народу; ГОСПАД зыйдзе сярод волатаў.
14 Ад Эфраіма прыйшлі князі ў даліну, за ім Бэн’ямін з народам сваім. Ад Махіра князі
прыйшлі, і ад Завулёна [прыйшлі] тыя, што трымаюць скіпетр.
15 Князі Ісахара былі з Дэбораю; і Ісахар разам з Баракам пасланы быў у даліну. А ў ваколіцах
Рубэна вялікая нарада.
16 Чаму ты сядзіш паміж аборамі, каб слухаць мэканьне статку? У ваколіцах Рубэна вялікая
нарада.
17 Гілеад адпачывае за Ярданам, а Дан як вандроўнік узыйшоў на караблі. Асэр жыве на беразе
мора і пры затоках сваіх застаўся.
18 Завулён ахвяраваў душу сваю на сьмерць, а Нэфталі — у гарыстых мясцовасьцях.
19 Прыйшлі валадары і ваявалі, ваявалі валадары Ханаану ў Таанаху каля водаў Мэгіддо, але
здабычы срэбра не атрымалі!
20 З неба змагаліся зоркі, з шляхоў сваіх супраць Сісэры ваявалі.
21 Ручай Кішон панёс іх, ручай старадаўні, ручай Кішон; трымайся моцна, душа мая.
22 Тады гучаў тупат капытоў коней, калі імчалі дужыя іхнія.

23 “Праклінайце Мэроз, — сказаў анёл ГОСПАДА, — праклінайце праклёнам жыхароў ягоных,
бо не прыйшлі яны на дапамогу ГОСПАДУ, на дапамогу ГОСПАДУ з волатамі [сваімі]”.
24 Няхай будзе дабраслаўлёная між жанчынамі Яэль, жонка Хэвэра Кенэяніна, няхай будзе
яна дабраслаўлёная між жанчынамі ў намётах!
25 Таму, хто прасіў вады, яна дала малака, і ў куфлі князёў прынесла яму малако.
26 Левай рукой узяла калок, а правай — кавальскі молат. І ўдарыла Сісэру, і прабіла галаву
яму, скроні яго разьбіла.
27 Каля ног яе ён зваліўся, упаў і ляжаў, каля ног яе ўпаў, паваліўся. Дзе ўпаў, там і ляжаў
забіты.
28 Праз акно глядзіць маці Сісэры і галосіць праз ваконныя краты: “Чаму марудзіць калясьніца
ягоная вярнуцца? Чаму не сьпяшаецца грукат калясьніцаў ягоных?”
29 Разумнейшыя з жанчынаў ейных адказваюць ёй, і сама сабе паўтарае яна словы іхнія:
30 “Дык жа зьбіраюць здабычу і разьдзяляюць па паланянцы ці па дзьве кожнаму ваяру, а шаты
каляровыя — для Сісэры, шаты каляровыя, гафтаваныя, а на шыю той, [якая дзеліць] здабычу
— каляровыя хусткі”.
31 Няхай гэтак, ГОСПАДЗЕ, зьнікнуць усе ворагі Твае! А тыя, што любяць Цябе, няхай ясьнеюць
як сонца, якое ўзыходзіць!» І зямля жыла ў супакоі сорак гадоў.

Суд 6

1 І сыны Ізраіля чынілі зло ў вачах ГОСПАДА, і ГОСПАД аддаў іх на сем гадоў у рукі Мадыянцаў.
2 І рука Мадыянцаў цяжэла над Ізраілем. І сыны Ізраіля [ад страху] перад Мадыянцамі парабілі
сабе сховішчы і пячоры ў гарах і ўмацаваныя месцы.
3 Калі Ізраільцяне сеялі, прыходзілі Мадыянцы, і Амалек, і сыны Усходу, і хадзілі сярод іх,
4 і раскладаліся ў іх табарам, і нішчылі плады зямлі аж да Газы, не пакідаючы для Ізраіля ніякіх
сродкаў для жыцьця: ані авечак, ані валоў, ані аслоў.
5 Яны прыходзілі разам са статкамі сваімі і намётамі сваімі, і прыходзілі як мноства саранчы.
І іх, і вярблюдаў іхніх нельга было палічыць. І хадзілі яны па зямлі Ізраіля, каб пустошыць яе.
6 Вельмі зьбяднеў Ізраіль ад Мадыянцаў. І клікалі сыны Ізраіля да ГОСПАДА.
7 І клікалі сыны Ізраіля да ГОСПАДА з прычыны Мадыянцаў,
8 і ГОСПАД паслаў да сыноў Ізраіля прарока, і ён сказаў ім: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я
вывеў вас з Эгіпту, вывеў вас з дому няволі,
9 і вызваліў вас з рук Эгіпцянаў і з рук усіх прыгнятальнікаў вашых, і выгнаў іх перад абліччам
вашым, і аддаў вам зямлю іхнюю.
10 І Я вам сказаў: "Я — ГОСПАД, Бог ваш, ня бойцеся багоў Амарэйцаў, на зямлі якіх вы жывеце".
Але вы ня слухалі голас Мой”»
11 І прыйшоў анёл ГОСПАДА, і сеў пад дубам у Офры, якая [належала] Ёашу з [роду] Абіезэра.
Гідэон, сын ягоны, малаціў у тоўчні збожжа, каб схаваць [яго] ад Мадыянцаў.
12 І зьявіўся яму анёл ГОСПАДА, і сказаў яму: «ГОСПАД з табою, ваяр мужны!»
13 Гідэон сказаў яму: «Прабач, гаспадару мой, калі ГОСПАД з намі, адкуль прыйшло ўсё гэта?
Дзе ўсе цуды Ягоныя, пра якія расказвалі нам бацькі нашыя, кажучы: “З Эгіпту вывеў нас
ГОСПАД”. А цяпер пакінуў нас ГОСПАД і аддаў нас у рукі Мадыянцаў».
14 І зьвярнуўся да яго ГОСПАД, і сказаў: «Ідзі з гэтай сілаю тваёй і збаў Ізраіля з рукі Мадыянцаў.
Я пасылаю цябе».
15 І адказаў [Гідэон]: «Госпадзе! Якім чынам я вызвалю Ізраіля? Род мой найбяднейшы ў
[калене] Манасы, а я — апошні ў доме бацькі майго».
16 І ГОСПАД сказаў яму: «Я буду з табою, і ты паб’еш Мадыянцаў як аднаго чалавека».
17 І адказаў ён Яму: «Калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх, дай мне нейкі знак, што гэта Ты
гаворыш са мною.
18 Не адыходзься адгэтуль, пакуль я прыйду да Цябе і прынясу ахвяру маю, і складу яе Табе».
І [Госпад] сказаў: «Пачакаю, пакуль вернешся».

19 І Гідэон пайшоў, і падрыхтаваў казьляня і праснакоў з эфы мукі, і мяса палажыў у кош, а
страву — у гаршчок, і прынёс гэта ўсё пад дуб, і ахвяраваў Яму.
20 І сказаў яму анёл Божы: «Вазьмі мяса і праснакі, і палажы іх на скале гэтай, а страву вылі
наверх». І ён зрабіў гэта.
21 І анёл ГОСПАДА працягнуў канец кія, які [трымаў] у руцэ Сваёй, і дакрануўся ім да мяса і
праснакоў, і выйшаў агонь са скалы, і спаліў мяса і праснакі. І анёл ГОСПАДА зьнік з вачэй
ягоных.
22 І ўбачыў Гідэон, што гэта быў анёл ГОСПАДА, і сказаў Гідэон: «Гора мне, Госпадзе, ГОСПАДЗЕ,
бо я бачыў анёла ГОСПАДА тварам у твар!»
23 І сказаў яму ГОСПАД: «Супакой табе, ня бойся, не памрэш!»
24 І пабудаваў там Гідэон ахвярнік ГОСПАДУ і назваў яго: “Ягвэ-Шалом”. Аж па сёньняшні
дзень [ахвярнік] гэты ў Офры Абіезэравай.
25 У тую ноч сказаў ГОСПАД [Гідэону]: «Вазьмі бычка са [статку] бацькі твайго і другога бычка,
сямігадовага, і развалі ахвярнік Баала, які ў бацькі твайго, і сьсячы сьвятое дрэва, якое каля
[ахвярніка],
26 і пастаў ахвярнік ГОСПАДУ, Богу твайму, на версе гэтай скалы ў адпаведны спосаб. І вазьмі
другога бычка, і складзі цэласпаленьне на дровах са сьвятога дрэва, якое сьсячэш».
27 І ўзяў Гідэон дзесяць чалавек слугаў сваіх, і зрабіў, як прамовіў яму ГОСПАД. Але баяўся ён
дому бацькі свайго і жыхароў таго гораду, і не зрабіў гэтага ўдзень, але зрабіў уначы.
28 І раніцаю ўсталі людзі таго гораду, і вось, развалены ахвярнік Баала і сьсечанае сьвятое
дрэва, якое пры ім, і другі бычок складзены ў ахвяру цэласпаленьня на пабудаваным
ахвярніку.
29 І казалі яны адзін аднаму: «Хто гэта зрабіў?» І шукалі, і даведваліся, і сказалі: «Гідэон, сын
Ёаша, зрабіў гэта».
30 І людзі гораду таго сказалі Ёашу: «Выведзі сына твайго, і няхай ён памрэ, бо ён разваліў
ахвярнік Баала і сьсек сьвятое дрэва, якое пры ім».
31 А Ёаш сказаў усім, што стаялі каля яго: «Ці ж вы хочаце бараніць Баала і дапамагаць яму?
Хто будзе заступацца за Баала, будзе забіты да раніцы. Калі ён — бог, няхай сам заступаецца
за сябе супраць таго, хто разваліў ахвярнік ягоны».
32 З таго дня Гідэона назвалі Еруббаал, кажучы: «Няхай Баал змагаецца з ім, бо ён разваліў
ахвярнік ягоны».
33 А ўсе Мадыянцы, Амалек і сыны Усходу сабраліся разам і пераправіліся [праз Ярдан], і
разлажыліся табарам у лагчыне Езрээль.
34 І Дух ГОСПАДА ахапіў Гідэона, і ён затрубіў у рог, і сабраў пры сабе [дом] Абіезэра.
35 І паслаў ён пасланцоў да ўсяго Манасы, і яны сабралася пры ім, і паслаў пасланцоў да Асэра,
Завулёна і Нэфталі, і яны пайшлі, каб з ім злучыцца.
36 І сказаў Гідэон Богу: «Калі сапраўды хочаш выратаваць Ізраіля рукою маёй, як Ты прамовіў,
37 вось, я расьцялю на таку стрыжаную воўну. Калі раса будзе толькі на воўне, а на ўсёй зямлі
будзе суха, я буду ведаць, што рукою маёй Ты вызваліш Ізраіль, як Ты прамовіў».
38 І так сталася. І ён устаў раніцаю, і сьціснуў воўну, і выціснуў поўны куфаль вады.
39 І сказаў Гідэон Богу: «Ня гневайся на мяне, калі яшчэ раз прамоўлю да Цябе. Дазволь яшчэ
раз выпрабаваць праз воўну. Няхай [раніцаю] будзе сухой толькі воўна, а кругом на зямлі
будзе росна».
40 І зрабіў гэта Бог уначы, і толькі воўна засталася сухой, а ўся зямля была роснай.

Суд 7

1 І ўстаў раніцаю Еруббаал або Гідэон, і ўвесь народ, які з ім, і разлажыліся табарам каля
крыніцы Харод. А табар Мадыянцаў быў на поўнач ад яго, каля ўзгорка Морэ, у лагчыне.
2 І сказаў ГОСПАД Гідэону: «Залішне народу пры табе, каб у рукі ягоныя Я выдаў Мадыянцаў,
бо Ізраіль можа ўзьвялічваць сябе, кажучы: “Рука мая вызваліла мяне”.

3 І цяпер скажы ў вушы народу, кажучы: “Хто баіцца і палахлівы, той няхай вернецца і зыйдзе
з гары Гілеад”». І вярнулася з народу дваццаць дзьве тысячы, а засталося дзесяць тысячаў.
4 І сказаў ГОСПАД да Гідэона: «Яшчэ зашмат народу. Завядзі яго да вады, і Я выспрабую яго.
Пра каго табе скажу, каб ішоў з табою, той няхай пойдзе, а каму ісьці забараню, той няхай ня
пойдзе».
5 І зыйшоў народ да вады, і сказаў ГОСПАД Гідэону: «Хто языком сваім будзе хлёбаць ваду, як
сабакі хлёбаюць, тых пастаў асобна, а тых, якія ўкленчыўшы на калені свае будуць піць ваду,
[асобна]».
6 І тых, якія хлёбалі ваду рукой, [падносячы] да вуснаў, было трыста чалавек. А ўсе астатнія
пілі ўкленчыўшы.
7 І сказаў ГОСПАД Гідэону: «Трыма сотнямі людзей, якія хлёбалі ваду, Я збаўлю вас, і аддам
Мадыянцаў у руку тваю, а ўвесь народ няхай ідзе, кожны на месца сваё».
8 І ўзяў народ ежу ў руку сваю і трубы. І ўсім іншым загадаў [Гідэон] вярнуцца ў намёты свае,
а тых трыста чалавек затрымаў пры сабе. Табар жа Мадыянцаў быў пад ім у лагчыне.
9 У тую ноч ГОСПАД сказаў яму: «Устань і ідзі ў табар, бо Я аддаю яго ў рукі твае.
10 Калі баішся ісьці адзін, няхай ідзе з табою ў табар Пура, слуга твой.
11 Калі ты пачуеш, што яны гавораць, тады ўмацуюцца рукі твае, і ты пойдзеш на табар
[ворагаў]». І зыйшоў ён і слуга ягоны Пура да самых вартаўнікоў табару.
12 А Мадыянцы, Амалек і ўсе сыны Усходу разьмясьціліся ў лагчыне, шматлікія, як саранча. І
вярблюдаў іхніх было бяз ліку, як пяску, які на беразе мора.
13 І прыйшоў [туды] Гідэон, і вось, чалавек расказваў сон бліжняму свайму і казаў: «Я меў сон.
І вось, бохан хлеба ячменнага прыкаціўся да табару Мадыянцаў, і калі дакаціўся да намёту,
ударыў у яго і перавярнуў яго, і намёт разваліўся».
14 І адказаў бліжні ягоны, кажучы: «Гэта нішто іншае, як меч Гідэона, сына Ёаша,
Ізраільцяніна. Аддаў Бог у рукі ягоныя Мадыянцаў і ўвесь табар іхні».
15 Калі Гідэон пачуў аповед пра сон і тлумачэньне ягонае, пакланіўся [Богу] і вярнуўся ў табар
Ізраіля, і сказаў: «Устаньце! Бо ГОСПАД аддаў у рукі вашыя табар Мадыянцаў».
16 І падзяліў ён трыста чалавек на тры аддзелы, і даў кожнаму з іх трубы і пустыя збаны, і
паходні ўнутры збаноў.
17 І сказаў ім: «Глядзіце на мяне, і рабіце тое самае, што я. Калі я дайду да табару, што я буду
рабіць, тое і вы рабіце.
18 Калі я затрублю ў рог, і вы трубіце ў рогі кругом табару і крычыце: “[Меч] ГОСПАДА і
Гідэона!”»
19 І дайшоў Гідэон і сто мужчынаў, якія былі з ім, да самага табару на пачатку сярэдняй начной
варты, калі толькі паставілі вартаўнікоў. І затрубілі яны ў рогі, і пабілі збаны, якія [былі] ў
руках іхніх.
20 І затрубілі ў рогі тры аддзелы, і пабілі збаны, і ўзялі ў левую руку паходні, а ў правую — рогі,
каб імі трубіць, і крычалі: «Меч ГОСПАДА і Гідэона!»
21 І стаяў кожны на месцы сваім вакол табару, а ў-ва ўсім табары пачалі бегаць і крычаць, і
кінуліся ўцякаць.
22 І калі тыя трыста чалавек трубілі ў рогі, скіраваў ГОСПАД меч аднаго на другога ў-ва ўсім
табары. І табар уцёк аж да Бэт-Гашыты ў кірунку Царэтану і Абэль-Мэхолы каля Табаты.
23 І сабраліся Ізраільцяне з [каленаў] Нэфталі і Асэра і з усяго [калена] Манасы, і гналіся за
Мадыянцамі.
24 І Гідэон паслаў пасланцоў на ўсе горы Эфраіма, кажучы: «Выходзьце супраць Мадыянцаў
і перахапіце ў іх [броды] праз воды Ярдану аж да Бэт-Бары». І сабраліся ўсе сыны Эфраіма, і
заступілі броды на Ярдане аж да Бэт-Бары.
25 І захапілі яны двух князёў Мадыянскіх, Арэба і Зээба, і забілі Арэба ў Цур-Арэбе, а Зээба забілі
ў Экэб-Зээбе. І гналіся за Мадыянцамі, а галовы Арэба і Зээба прынесьлі Гідэону за Ярдан.

Суд 8

1 І сказалі Гідэону сыны Эфраіма: «Што гэта такое, што не захацеў ты браць нас ваяваць
супраць Мадыянцаў?» І моцна з ім спрачаліся.
2 А ён ім сказаў: «Ці зрабіў я што такое, што вы зрабілі? Ці ня лепшы апошні збор вінаграду ў
Эфраіма, чым першы ў Абіезэра?
3 У рукі вашыя аддаў Бог князёў Мадыянскіх Арэба і Зээба. Што болей мог я зрабіць у
параўнаньні з вамі?» Калі ён сказаў словы гэтыя, супакоілася ў іх абурэньне супраць яго.
4 І прыйшоў Гідэон да Ярдану, і перайшоў яго з трымастамі ваярамі, якія з ім былі. А былі яны
змучаныя, перасьледуючы ворагаў.
5 І сказаў Гідэон жыхарам Сукоту: «Дайце, калі ласка, людзям маім хлеба, бо яны вельмі
стаміліся, а я перасьледую Зэбаха і Цальмуну, валадароў Мадыянскіх».
6 А князі Сукоту адказалі: «Ці ўжо рукі Зэбаха і Цальмуны ў руках тваіх, каб мелі мы даваць
хлеб войску твайму?»
7 І сказаў Гідэон: «Калі выдасьць ГОСПАД Зэбаха і Цальмуну ў рукі мае, я буду малаціць целы
вашыя цернем пустынным і асотам».
8 І пайшоў адтуль у Пэнуэль, і падобна прасіў жыхароў той мясцовасьці. І тыя яму адказалі, як
жыхары Сукоту.
9 І таксама ім ён сказаў: «Калі вярнуся ў супакоі, развалю вежу вашую».
10 А Зэбах і Цальмуна адпачывалі ў Каркоры з усім войскам сваім, каля пятнаццаці тысячаў
ваяроў, якія засталіся з усіх дружынаў сыноў Усходу. А тых, што згінулі, было сто дваццаць
тысячаў чалавек, якія валодалі мячом.
11 І Гідэон пайшоў шляхам жыхароў намётаў на ўсход ад Набаху і Ёгбэгі, і напаў на табар
ворагаў, якія пачуваліся ў бясьпецы.
12 Зэбах і Цальмуна ўцяклі, але Гідэон дагнаў іх і схапіў абодвух валадароў Мадыяну, Зэбаха і
Цальмуну, а ўсё войска іхняе разьбіў.
13 І варочаўся Гідэон, сын Ёаша, з вайны праз Маале-Га-Хэрэс.
14 І схапіў ён юнака з жыхароў Сукоту, і спытаў у яго пра князёў і старшыняў Сукоту. І той
напісаў яму [імёны] сямідзесяці сямі чалавек.
15 І прыйшоў ён да жыхароў Сукоту, і сказаў ім: «Вось Зэбах і Цальмуна, дзеля якіх вы абражалі
мяне, кажучы: “Ці ж рука Зэбаха і Цальмуна ўжо ў руках тваіх, каб даваць хлеб ваярам тваім,
што зьняможаны?”»
16 І схапіў ён старшыняў гораду, і, узяўшы церні пустынныя і асот, пакараў імі жыхароў Сукоту.
17 Таксама вежу Пэнуэля разваліў і выбіў жыхароў гораду таго.
18 І сказаў Зэбаху і Цальмуне: «Што гэта за людзі былі, якіх вы забілі каля Табору?» Яны
адказалі: «Яны былі падобныя да цябе, і кожны з іх меў выгляд сыноў валадара».
19 Ён ім сказаў: «Гэта былі браты мае, сыны маці маёй. Як жывы ГОСПАД! Калі б вы іх захавалі,
я вас не забіў бы!»
20 І даў ён загад Етэру, першароднаму свайму: «Устань і забі іх!» Але ён ня выцягнуў мяча, бо
баяўся, бо быў яшчэ малы.
21 І сказалі Зэбах і Цальмуна: «Ты сам устань і забі нас, бо які чалавек, такая і сіла ягоная».
І ўстаў Гідэон, і забіў Зэбаха і Цальмуна, і забраў паўмесяцы, што віселі на шыях вярблюдаў
іхніх.
22 І сказалі Ізраільцяне Гідэону: «Валадар над намі ты, і сын твой, і ўнук твой, бо ты вызваліў
нас з рук Мадыянцаў».
23 І сказаў ён ім: «Ня буду я валадарыць над вамі, і ня будзе валадарыць над вамі сын мой, але
будзе валадарыць над вамі ГОСПАД».
24 І гаварыў ім: «Адну толькі маю просьбу да вас: дайце мне кожны па колцу са здабычы
вашай». Бо звычайна залатыя колцы насілі [забітыя], бо былі Ізмаэльцы.
25 Яны адказалі: «Вельмі ахвотна дамо». І расклалі плашч на зямлі, і кожны са здабычы сваёй
палажыў залатое колца.

26 І вага прынесеных залатых колцаў была тысяча семсот сыкляў золата, ня лічачы паўмесяцаў, колцаў і пурпуровых шатаў, якія насілі валадары Мадыянскія, таксама ня лічачы ланцужкоў, што віселі на шыях вярблюдаў іхніх.
27 З іх зрабіў Гідэон эфод і паставіў яго на радзіме сваёй, у Офры. І ўвесь Ізраіль чужаложыў там з ім, і сталася гэта для Гідэона і сям'і ягонай загубай.
28 І ўпакорыліся Мадыянцы перад сынамі Ізраіля, і не паднялі яны болей галавы, і зямля сорак гадоў адпачывала, калі жыў Гідэон.
29 І Ерубаал, сын Ёаша, пайшоў, і жыў у доме сваім.
30 Гідэон меў семдзясят сыноў, што выйшлі з паясьніцы ягонай, бо меў шмат жонак.
31 Адна з наложніцаў ягоных, што жыла ў Сыхеме, нарадзіла яму сына, якому дадзена імя Абімэлех.
32 Праз нейкі час Гідэон, сын Ёаша, памёр у добрай старасьці, і быў пахаваны ў магіле Ёаша, бацькі свайго, у Офры Абіезэравай.
33 Пасьля сьмерці Гідэона зноў сыны Ізраіля адвярнуліся ад ГОСПАДА і паганіліся з Баалам, і паставілі Баал-Бэрыта за бога сабе.
34 І забыліся сыны Ізраіля пра ГОСПАДА, Бога свайго, Які вызваліў іх з рукі ўсіх ворагаў іхніх навакол.
35 І не зьявілі яны спагаднасьці для сям'і Ерубаала, ці Гідэона, нягледзячы на тое, што столькі дабра зрабіў ён для Ізраіля.

Суд 9

1 Абімэлех, сын Ерубаала, пайшоў у Сыхем да братоў маці сваёй і сказаў ім і ўсім сваякам з дому маці сваёй, кажучы:
2 «Скажыце ўсім людзям у Сыхеме: "Што вам лепш: каб панавалі над вамі ўсе семдзясят сыноў Ерубаала, ці каб панаваў над вамі адзін чалавек?" І майце на ўвазе, што я — костка з косткі вашай і цела з цела вашага».
3 І браты маці ягонай расказвалі пра яго ўсім людзям у Сыхеме ў такі спосаб, і сэрцы іхнія прыхіліліся да Абімэлеха, бо яны казалі: «Гэта брат наш!»
4 І далі яму семдзясят сыкляў срэбра з дому Баал-Бэрыта, і Абімэлех наняў за іх прайдзісьветаў і людзей бадзяжных, якія пайшлі за ім.
5 І вярнуўся ён у дом бацькі свайго ў Офры, і на адным камяні забіў братоў сваіх, сыноў Ерубаала, семдзясят чалавек. Пакінуў толькі Ётама, наймалодшага сына Ерубаала, бо ён быў схаваўшыся.
6 І сабраліся ўсе мужчыны з Сыхему і ўвесь Бэт-Міло, і пайшлі, і паставілі Абімэлеха валадаром каля дуба, які стаяў блізка Сыхему.
7 Калі паведамілі пра гэта Ётаму, ён пайшоў і стаў на вяршыні гары Гарызім, і ўзвысіў голас свой, і сказаў: «Слухайце мяне, людзі Сыхему, і няхай пачуе вас Бог.
8 Сабраліся дрэвы, каб выбраць сабе валадара, і сказалі яны аліўцы: "Валадар над намі".
9 Яна адказала: "Ці ж магу я выракчыся алею свайго, якім ганарацца богі і людзі, каб пайсьці хістацца па-над дрэвамі?"
10 І сказалі дрэвы дрэву фігаваму: "Хадзі і будзь валадаром над намі".
11 Адказала ім дрэва фігавае: "Ці ж маю я выракчыся салодкасьці сваёй і адборнага плоду свайго, каб пайсьці хістацца па-над дрэвамі?"
12 І сказалі дрэвы вінаграду: "Хадзі і будзь валадаром над намі".
13 Вінаград ім адказаў: "Ці ж маю я выракчыся соку свайго, які весяліць багоў і людзей, каб пайсьці хістацца па-над дрэвамі?"
14 Тады сказалі ўсе дрэвы цярніне: "Хадзі і будзь валадаром над намі!"
15 Адказала цярніна дрэвам: "Калі сапраўды хочаце мяне памазаць на валадара, тады хадзіце і адпачніце ў ценю маім! А калі не, вось, агонь выйдзе з цярніны і спаліць кедры Лібанскія".
16 І цяпер, калі справядліва і бяз грэху вы паставілі над сабой валадаром Абімэлеха, і калі добра абыйшліся з Ерубаалам і з домам ягоным, і аднагарадзіліся адпаведна дабрадзействамі таму,

17 які ваяваў за вас і жыцьцё сваё выстаўляў за вас на небясьпеку, каб выратаваць вас з рук
Мадыянцаў,
18 а вы сёньня паўсталі супраць дому бацькі майго і забілі сыноў ягоных семдзясят чалавек на
адным камяні, і выбралі сабе валадаром над жыхарамі Сыхему Абімэлеха, сына служкі ягонай,
бо ён — брат ваш,
19 дык калі справядліва і без памылкі ўчынілі вы з Еруббаалам і домам ягоным сёньня, цешцеся
з Абімэлеха, і няхай ён цешыцца з вас.
20 Калі ж крывадушна зрабілі, няхай агонь выйдзе з Абімэлеха і спаліць жыхароў Сыхему і
Бэт-Міло, і няхай выйдзе агонь з жыхароў Сыхему і Бэт-Міло і спаліць Абімэлеха!»
21 Калі гэта Ётам сказаў, ён уцёк і адыйшоў у Бэра, і жыў там, баючыся брата свайго Абімэлеха.
22 І валадарыў над Ізраілем Абімэлех тры гады.
23 І спаслаў на Абімэлеха Бог духа ліхога між ім і жыхарамі Сыхему, якія збунтаваліся супраць
яго,
24 каб такім чынам споўнілася помста за забойства сямідзесяці сыноў Еруббаала, і кроў
іхняя павярнулася на Абімэлеха, брата іхняга, які забіў іх, і на жыхароў Сыхему, якія яму
дапамагалі.
25 І вось, жыхары Сыхему зрабілі засаду на яго на вяршыні гары, і нападалі на кожнага, хто
праходзіў тою дарогаю. І паведамлена было пра гэта Абімэлеху.
26 Тады Гаал, сын Эбэда, прыйшоў з братамі сваімі ў Сыхем, і жыхары Сыхему паверылі яму.
27 І выйшлі яны ў поле, і рвалі вінаград, і выціскалі яго, і сьвяткавалі. І ўвайшлі яны ў сьвятыню
бога свайго, там елі, і пілі, і праклiналі Абімэлеха.
28 І казаў Гаал, сын Эбэда: «Хто такі Абімэлех, і хто такі Сыхем, каб мелі мы служыць яму?
Ці ж ён не сын Еруббаала, а Зэбул — урадовец ягоны? Лепш служыце людзям Гамора, бацькі
Сыхема. Навошта мы будзем служыць [Абімэлеху]?
29 Калі б хто аддаў гэты народ пад руку маю, я прагнаў бы Абімэлеха і сказаў бы яму: “Зьбяры
войска сваё і ідзі адсюль!”»
30 І Зэбул, начальнік гораду, чуючы гаворку Гаала, сына Эбэда, вельмі раззлаваўся,
31 і паслаў таемна пасланцоў да Абімэлеха, кажучы: «Вось, Гаал, сын Эбэда, і браты ягоныя
прыйшлі ў Сыхем і збунтавалі народ супраць цябе.
32 Дык устань уначы ты і народ твой, і зрабіце засаду ў полі.
33 А раніцаю, калі сонца ўзыйдзе, падрыхтуйся і нападзі на горад. І калі ён і народ, які з ім,
выйдзе супраць цябе, зробіш з ім тое, што зможа рука твая».
34 І ўстаў Абімэлех і народ ягоны ўначы, і ў чатырох месцах зрабілі засаду супраць Сыхему.
35 Калі Гаал, сын Эбэда, выйшаў і стаў у браме гораду, выйшаў таксама і Абімэлех і ўсё войска
з ім з засады.
36 Гаал убачыў войска і зьвярнуўся да Зэбула: «Вось, нейкія людзі зыходзяць з вяршыні гары».
Адказаў яму Зэбул: «Гэта цень гары, а табе здаецца, што людзі».
37 Зноў Гаал сказаў: «Вось, нейкія людзі зыходзяць з вяршыні, а адзін аддзел ідзе дарогаю ад
Элон-Мэанэніму».
38 І сказаў яму Зэбул: «Дзе ж цяпер вусны твае, якія казалі: “Хто такі Абімэлех, каб мелі мы
яму служыць?” Ці ж гэта ня той народ, якім ты пагарджаеш? Ідзі і ваюй супраць яго».
39 І пайшоў Гаал на чале жыхароў Сыхему, і ваяваў супраць Абімэлеха.
40 І гнаў яго Абімэлех, і ён уцякаў, і загінула мноства з боку [Гаала] ў дарозе да брамы гораду.
41 І Абімэлех вярнуўся ў Аруму, а Гаала і братоў ягоных Зэбул выгнаў, і забараніў ім жыць у
Сыхеме.
42 І назаўтра выйшаў народ у поле, і было пра гэта паведамлена Абімэлеху.
43 І ён сабраў войска сваё, падзяліў на тры дружыны, і зрабіў засаду ў полі, і, бачачы, што народ
выходзіць з гораду, напаў і пабіў іх.
44 У час, калі Абімэлех і дружына ягоная напалі і сталі пад брамай гораду, дзьве другія
дружыны напалі на ўсіх тых, якія былі ў полі, і пабілі іх.

45 І Абімэлех увесь той дзень аблягаў горад, і здабыў яго, і выбіў людзей ягоных, і пасьля
зьнішчэньня яго пасыпаў яго сольлю.
46 Калі гэта пачулі тыя, што былі ў вежы Сыхемскай, зыйшлі ў сутарэньні дому Баал-Бэрыта.
47 Абімэлех, пачуўшы, што ўсе князі Сыхемскія схаваліся там,
48 з усім народам сваім падняўся на гару Цальмон, і ўзяў сякеру, і адсек сук ад дрэва, і ўзлажыў
на плячо, і загадаў народу, які быў з ім: «Што я раблю, і вы рабіце».
49 І яны, хутка насекшы гальля з дрэваў, пайшлі за ім, і заклалі сутарэньні, а пасьля падпалілі.
І ад агню і дыму ўсе людзі пагінулі, а было каля тысячы мужчынаў і жанчынаў, усе жыхары
Сыхему.
50 Адтуль пайшоў Абімэлех на Тэбэц, і аблягаў Тэбэц, і здабыў яго.
51 А ў сярэдзіне гораду была моцная вежа, у якой схаваліся ўсе мужчыны і жанчыны, усе
жыхары гораду, і, моцна замкнуўшы браму, узыйшлі на верх той вежы.
52 Абімэлех падыйшоў пад самую вежу і пачаў яе здабываць. І калі падыйшоў да брамы вежы,
жадаючы падлажыць пад яе агонь,
53 нейкая жанчына кінула яму на галаву камень і разьбіла чэрап.
54 Тады ён паклікаў збраяносца свайго і сказаў яму: «Дастань меч твой і забі мяне, каб не
казалі, што я забіты жанчынаю». І ўдарыў яго юнак мячом, і ён памёр.
55 Пасьля сьмерці ягонай усе мужчыны Ізраіля, бачачы гэта, вярнуліся ў пасяленьні свае.
56 Так Бог вярнуў Абімэлеху за зло, якое ён зрабіў бацьку свайму, забіваючы семдзясят братоў
сваіх.
57 Таксама жыхарам Сыхему было вернута за ўсё, што яны зрабілі, і на іх прыйшоў праклён
Ётама, сына Еруббаала.

Суд 10

1 Пасьля Абімэлеха на вызваленьне Ізраіля паўстаў Тола, сын Пуа, сына Додо, чалавек з калена
Ісахара. Жыў ён у Шаміры на гары Эфраіма.
2 Ён судзіў Ізраіля дваццаць тры гады, і памёр, і пахаваны быў у Шаміры.
3 Пасьля яго быў Яір з Гілеаду, які судзіў Ізраіля дваццаць два гады.
4 Меў ён трыццаць сыноў, якія езьдзілі на трыццаці аслах і мелі трыццаць гарадоў, якія па
сёньняшні дзень называюцца Хавот-Яір; яны ў зямлі Гілеад.
5 І памёр Яір, і пахавалі яго ў Камоне.
6 А сыны Ізраіля чынілі ліхоту ў вачах ГОСПАДА. І служылі яны Баалам і Астартам, багам
Араму, Сідону і Мааву, і багам сыноў Амона, і багам Філістынцаў, і пакінулі яны ГОСПАДА, і
не пакланяліся Яму.
7 І разгневаўся на іх ГОСПАД, і аддаў іх у рукі Філістынцаў і ў рукі сыноў Амона.
8 І яны васямнаццаць гадоў перасьледавалі і ўціскалі сыноў Ізраіля, якія жылі за Ярданам у
зямлі Амарэйцаў у Гілеадзе.
9 Сыны Амона пераходзілі таксама Ярдан ваяваць супраць Юды і Бэн'яміна, і ўсяго дому
Эфраіма. І быў Ізраіль у вялікім уціску.
10 І клікалі сыны Ізраіля ГОСПАДА, і казалі: «Саграшылі мы перад Табою, бо пакінулі Бога
нашага, і служылі Баалу».
11 І сказаў ім ГОСПАД: «Калі Эгіпцяне, Амарэйцы, сыны Амона і Філістынцы,
12 Сідонцы, Амалек і Мадыян уціскалі вас, а вы клікалі Мяне, ці ж Я не ратаваў вас з рук іхніх?
13 А вы ўсё роўна пакідалі Мяне і пакланяліся багам чужым. Таму ня буду ратаваць вас болей.
14 Ідзіце і клічце багоў, якіх вы выбралі, няхай яны вас ратуюць у час гора!»
15 І казалі сыны Ізраіля ГОСПАДУ: «Саграшылі мы. Зрабі з намі, што добра ў вачах Тваіх, толькі
цяпер выратуй нас!»
16 І выкінулі яны спаміж сябе багоў чужых, якіх мелі, і служылі ГОСПАДУ, і Ён пашкадаваў
Ізраіля ў горы ягоным.
17 У той час сыны Амона сабраліся і разлажыліся табарам у Гілеадзе. А насупраць у Міцпе
сабраліся сыны Ізраіля, і там разлажыліся табарам.

18 І гаварылі народ і князі Гілеадзкія адзін аднаму: «Хто першы пачне ваяваць супраць сыноў
Амона, той будзе правадыром для ўсіх жыхароў Гілеаду».

Суд 11

1 А Ефтах Гілеадзец быў мужным ваяром. Быў ён сын распусьніцы, а бацькам ягоным быў
Гілеад.
2 Гілеад меў жонку, ад якой меў сыноў, якія, калі вырасьлі, выгналі Ефтаха, кажучы: «Ня
можаш быць спадкаемцам у доме бацькі нашага, бо ты нарадзіўся з другой жанчыны».
3 І ён уцёк ад іх, і жыў у зямлі Тоб, і сабраліся пры ім людзі бадзяжныя, і выходзілі з ім.
4 У тыя дні сыны Амона ваявалі супраць Ізраіля.
5 У час вайны Амона з Ізраілем прыйшлі старшыні Гілеадзкія ўзяць у дапамогу сабе Ефтаха з
зямлі Тоб.
6 І сказалі яны Ефтаху: «Хадзі і будзь нам правадыром, і будзем ваяваць супраць сыноў Амона».
7 Ён ім адказаў: «Ці ж вы не зьненавідзелі мяне і ня выкінулі мяне з дому бацькі майго? А
цяпер прыходзіце да мяне, калі бяда вас прыціснула».
8 І адказалі яму князі Гілеаду: «Вось з гэтай прычыны і прыйшлі мы да цябе, каб ты пайшоў з
намі, і ваяваў супраць сыноў Амона, і будзеш правадыром усіх, што жывуць у Гілеадзе».
9 І сказаў Ефтах старшыням Гілеадзкім: «Калі вы клічаце мяне, каб я ваяваў за вас супраць
сыноў Амона, і калі аддасьць іх ГОСПАД у рукі мае, я буду начальнікам вашым».
10 І сказалі старшыні Гілеадзкія Ефтаху: «ГОСПАД, Які чуе гэта, будзе пасярэднікам і сьведкам,
што споўнім слова тваё».
11 І пайшоў Ефтах з князямі Гілеаду, і ўвесь народ зрабіў яго правадыром сваім. І ўсе гэтыя
словы свае сказаў Ефтах перад ГОСПАДАМ у Міцпе.
12 І паслаў Ефтах пасланцоў да валадара сыноў Амона, каб яны сказалі ім ад яго: «Што табе і
мне, што ты прыйшоў ваяваць супраць мяне?»
13 Валадар сыноў Амона ім адказаў: «Бо Ізраіль забраў зямлю маю, калі выйшаў з Эгіпту, ад
Арнону аж да Ябоку і Ярдану. Вярні мне яе цяпер без вайны».
14 І зноў выправіў Ефтах пасланцоў да валадара Амону і сказаў:
15 «Гэта кажа Ефтах. Не забраў Ізраіль ані зямлі Мааву, ані зямлі сыноў Амона.
16 Але калі Ізраіль выходзіў з Эгіпту, ён вандраваў праз пустыню аж да Мора Чырвонага, і
потым прыйшоў у Кадэш.
17 І паслалі яны пасланцоў да валадара Эдому, кажучы: “Дазволь, каб прайшлі мы праз зямлю
тваю”. Але ён не згадзіўся на просьбу нашу. Паслалі таксама і да валадара Мааву, але і ён не
захацеў прапусьціць. І заставаўся Ізраіль у Кадэшы.
18 І, абыходзячы праз пустыню, абыйшоў кругом зямлю Эдому і зямлю Мааву і, прыйшоўшы
на ўсход ад зямлі Мааву, разлажыўся табарам за Арнонам, не ўваходзячы ў зямлю Мааву, бо
Арнон ёсьць мяжой Мааву.
19 І паслаў Ізраіль пасланцоў да Сыгона, валадара Амарэйцаў, валадара Хешбону, і сказаў яму:
“Дазволь перайсьці нам праз зямлю тваю да месца свайго”.
20 Але Сыгон не згадзіўся прапусьціць Ізраіля праз межы свае. Ён сабраў увесь народ свой, і
выступіў супраць Ізраіля ў Ягцы, і ваяваў з ім.
21 Але аддаў ГОСПАД у рукі Ізраіля яго і ўсё войска ягонае. Ізраіль перамог яго і завалодаў усёй
зямлёй Амарэйцаў, жыхароў краіны гэтай,
22 усімі межамі іхнімі ад Арнону да Ябоку, і ад пустыні аж да Ярдану.
23 ГОСПАД, Бог Ізраіля, выгнаў Амарэйцаў перад народам Сваім, Ізраілем, а ты цяпер хочаш
захапіць зямлю ягоную?
24 Ці ня ўсё тое, што даў табе бог твой Камош на ўласнасьць, табе належыць? А што ГОСПАД,
Бог наш, даў нам, мы маем на ўласнасьць.
25 Ці ты лепшы за Балака, сына Цыпора, валадара Мааву? Ці ж сварыўся ён з Ізраілем і ці ваяваў
супраць яго?

26 Ізраіль жыве ў Хешбоне і ў ваколіцах ягоных, і ў Араэры і ў ваколіцах ягоных, і ў-ва ўсіх
гарадах каля Арнону ўжо трыста гадоў. Чаму ў той час вы ня выгналі іх?
27 Дык ня я грашу адносна цябе, але ты супраць мяне несправядліва выходзіш з вайною. Няхай
ГОСПАД рассудзіць сёньня справу між сынамі Ізраіля і сынамі Амона!»
28 Але валадар сыноў Амона не захацеў прыняць слова Ефтаха, якія ён пераказаў праз
пасланцоў.
29 І Дух ГОСПАДА быў на Ефтаху, і ён прайшоў Гілеад і Манасу, і прыйшоў у Міцпу ў Гілеадзе, а
адтуль — да сыноў Амона.
30 І склаў ён шлюбаваньне ГОСПАДУ: «Калі Ты аддасі сыноў Амона ў рукі мае,
31 калі я буду вяртацца з мірам ад сыноў Амона, што выйдзе першым з брамы дому на
спатканьне мне, тое я складу ў цэласпаленьне ГОСПАДУ».
32 І пайшоў Ефтах супраць сыноў Амона ваяваць з імі, і аддаў ГОСПАД іх у рукі ягоныя.
33 І разьбіў ён іх на абшары ад Араэру аж да мясцовасьцяў Мініт, а гэта дваццаць гарадоў, і
далей аж да Абэль-Кераміму. І параза іхняя была вялікая. І былі ўпакораныя сыны Амона
перад абліччам сыноў Ізраіля.
34 І вярнуўся Ефтах у Міцпу ў дом свой, і выйшла насустрач яму дачка ягоная, скачучы пры
гуках бубнаў. А Ефтах ня меў апроч яе дзяцей.
35 І ён убачыў яе, і разьдзёр адзеньне сваё, і сказаў: «Ах, дачка мая! Ты зламала мяне! Ты ў ліку
тых, якія нешчасьлівяць мяне! Адчыніў я вусны мае ГОСПАДУ і не магу выракчыся гэтага».
36 Яна яму адказала: «Тата мой, калі ты адкрыў вусны твае перад ГОСПАДАМ, зрабі мне, што
ты шлюбаваў, дзеля дадзенай табе ГОСПАДАМ перамогі над ворагамі тваімі, сынамі Амона».
37 І гаварыла яна бацьку: «Толькі аднаго прашу. Дазволь мне на працягу двух месяцаў з
сяброўкамі маімі абыйсьці горы кругом і аплакаць дзявоцтва маё».
38 І ён адказаў ёй: «Ідзі!» І адпусьціў яе на два месяцы. І пайшла яна з сяброўкамі, і аплаквала
дзявоцтва сваё ў гарах.
39 І праз два месяцы яна вярнулася да бацькі свайго. І ўчыніў ён з ёй, як шлюбаваў, і яна не
пазнала мужа. Адсюль узяўся звычай у Ізраіля,
40 што кожны год сыходзіліся на чатыры дні дочкі Ізраіля, каб аплакваць дачку Ефтаха
Гілеадца.

Суд 12

1 І вось, сабраліся мужчыны Эфраіма, і прыйшлі ў Цафан, і сказалі Ефтаху: «Чаму пайшоў ты
ваяваць з сынамі Амона і не паклікаў нас, каб мы ішлі з табой? За гэта мы спалім дом твой
разам з табою».
2 І сказаў ім Ефтах: «Я і народ мой мелі вялікае змаганьне з сынамі Амона. І я клікаў вас на
дапамогу, але вы ня збавілі мяне ад рукі іхняй.
3 І ўбачыў я, што няма збаўцы, і палажыў душу маю на далоні мае, і пайшоў на сыноў Амона, і
выдаў іх ГОСПАД у рукі мае. Чаму сёньня вы падымаецеся ваяваць супраць мяне?»
4 І Ефтах сабраў да сябе ўсіх мужчынаў Гілеаду, і ваяваў супраць Эфраіма. І пабілі ваяры
Гілеадзкія Эфраіма, бо той казаў: «Вы — уцекачы з Эфраіма. Гілеад жыве пасярод Эфраіма
і Манасы».
5 І занялі Гілеадцы броды на Ярдане, якімі Эфраімцы маглі вярнуцца. І калі казалі ўцекачы
Эфраімцы: «Дазвольце мне прайсьці», Гілеадцы казалі яму: «Ці ты Эфраімец?» Калі той казаў:
«Не»,
6 казалі яму: «Скажы: “Шыболет”». І той казваў: «Сіболет», бо ня мог правільна вымавіць.
І бралі яго, і забівалі каля броду на Ярдане. Гэтак загінула ў той час у Эфраіма сорак дзьве
тысячы.
7 І Ефтах судзіў Ізраіля шэсьць гадоў, і памёр, і быў пахаваны ў горадзе сваім у Гілеадзе.
8 Пасьля яго судзіў Ізраіля Ібцан з Бэтлеему.
9 Ён меў трыццаць сыноў і трыццаць дочак, і пааддаваў іх замуж за межы свае, а адтуль прывёў
трыццаць жонак для сыноў сваіх. Ён судзіў Ізраіля сем гадоў.
10 І памёр Ібцан, і быў пахаваны ў Бэтлееме.

11 Пасьля яго судзіў Ізраіля Элон Завулёнец, і судзіў ён Ізраіля дзесяць гадоў.
12 І памёр Элон, і быў пахаваны ў Аялоне ў зямлі Завулёна.
13 Пасьля яго судзіў Ізраіля Абдон, сын Гілеля з Піратону.
14 Ён меў сорак сыноў і трыццаць унукаў, якія езьдзілі на сямідзесяці маладых аслах. Судзіў ён Ізраіля восем гадоў.
15 І памёр Абдон, сын Гілеля з Піратону, і пахаваны быў у Піратоне, у зямлі Эфраіма на гары Амалека.

Суд 13

1 Сыны Ізраіля зноў пачалі рабіць ліхоту ў вачах ГОСПАДА. І ГОСПАД аддаў іх на сорак гадоў у рукі Філістынцаў.
2 У Цоры быў нейкі чалавек з пакаленьня Дана на імя Маноах, які меў жонку няплодную.
3 І зьявіўся анёл ГОСПАДА той жанчыне, і сказаў: «Хоць ты няплодная і бязьдзетная, але зачнеш і народзіш сына.
4 Сьцеражыся, ня пі ані віна, ані сікеры, і нічога нячыстага ня еш,
5 бо зачнеш і народзіш сына, галавы якога не кранецца лязо. Ён будзе назірам Божым ад улоньня маці. Ён пачне выратоўваць Ізраіль з рук Філістынцаў».
6 Яна прыйшла да мужа і сказала яму: «Чалавек Божы прыходзіў да мяне, аблічча якога было як анёла ГОСПАДА, поўнае велічы. Не пытала я яго, адкуль ён, і не назваў ён мне імя свайго.
7 Ён сказаў мне: “Неўзабаве зачнеш і народзіш сына. Сьцеражыся, ня пі ані віна, ані сікеры, і нічога нячыстага ня еш, бо хлопец будзе назірам Божым ад улоньня маці аж да дня сьмерці сваёй”».
8 І маліўся Маноах да ГОСПАДА, і казаў: «Прашу Цябе, Госпадзе, няхай чалавек Божы, якога Ты паслаў, прыйдзе зноў і навучыць нас, што мы павінны рабіць з юнаком, які мае нарадзіцца?»
9 І выслухаў ГОСПАД, што прасіў Маноах, і зьявіўся зноў анёл Божы жанчыне, якая сядзела ў полі, а мужа ейнага, Маноаха, не было разам з ёю.
10 І пасьпяшалася яна, і прыбегла да мужа свайго, і паведаміла яму: «Вось, зьявіўся мне той чалавек, які тады быў прыйшоўшы да мяне».
11 Ён устаў і пайшоў за жонкай сваёй, і падыйшоў да чалавека таго, і сказаў яму: «Ці ты той, які размаўляў з жонкай маёй?» А ён сказаў: «Я».
12 І сказаў яму Маноах: «Калі споўніцца слова тваё, як нам сябе паводзіць з хлопцам і што маем рабіць?»
13 І сказаў Маноаху анёл ГОСПАДА: «Няхай усяго таго, што я сказаў жонцы тваёй, яна сьцеражэцца.
14 Няхай ня есьць нічога, што з вінаграду паходзіць, няхай ня п’е ані віна, ані сікеры, няхай нічога ня есьць нячыстага, але няхай тое, што я загадаў, выконвае».
15 І сказаў Маноах анёлу ГОСПАДА: «Дазволь затрымаць цябе, пакуль прыгатуем страву для цябе з казьляняці».
16 Анёл ГОСПАДА адказаў яму: «Калі ты мяне затрымаеш, я ня буду есьці хлеба твайго. А калі хочаш падрыхтаваць цэласпаленьне, ахвяруй яго ГОСПАДУ». Бо Маноах ня ведаў, што гэта анёл ГОСПАДА.
17 Маноах спытаўся ў анёла: «Якое імя тваё, і калі слова тваё споўніцца, як ушанаваць цябе?»
18 Анёл сказаў яму: «Навошта ты пытаешся пра імя маё, яно таямнічае».
19 І прынёс Маноах казьляня і ахвяру хлебную, і паклаў на скале, ахвяруючы ГОСПАДУ, Які творыць цуды. І глядзелі на гэта Маноах і жонка ягоная.
20 І калі полымя паднялося з ахвярніка ў неба, таксама анёл ГОСПАДА падняўся ў полымі. Калі гэта ўбачылі Маноах і жонка ягоная, упалі на абліччы свае на зямлю.
21 І ўжо болей ня бачылі яны анёла ГОСПАДА. І зразумеў Маноах, што гэта анёл ГОСПАДА,
22 і сказаў жонцы сваёй: «Хіба мы памром, бо мы бачылі Бога».
23 І сказала яму жонка: «Калі б ГОСПАД хацеў нас забіць, Ён не прыняў бы з рук нашых цэласпаленьня і ахвяры хлебнай, і ня даў бы бачыць нам усяго гэтага, і не сказаў бы нам усіх словаў гэтых».

24 І нарадзіла яна сына, і назвала яго імем Самсон. І хлопец рос, і дабраслаўляў яго ГОСПАД.
25 І Дух ГОСПАДА пачаў зыходзіць на яго ў табары Дана між Цораю і Эштаолам.

Суд 14

1 І зыйшоў Самсон у Тымну, і ўбачыў там жанчыну з дачок Філістынскіх.
2 І вярнуўся, і паведаміў бацьку свайму і маці: «У Тымне бачыў я жанчыну з дачок Філістынскіх. Цяпер вазьміце мне яе за жонку».
3 Бацька і маці сказалі яму: «Ці ж няма жынчыны між дачок братоў тваіх і ў-ва ўсім народзе маім, што захацеў ты ўзяць сабе жонку ў Філістынцаў неабрэзаных?» Сказаў Самсон бацьку свайму: «Вазьмі яе мне, бо ўпадабалі яе вочы мае».
4 Бацькі ж яго ня ведалі, што гэта справа ГОСПАДА і што Ён шукае прычыны выступіць супраць Філістынцаў, бо ў той час Філістынцы панавалі над Ізраілем.
5 І пайшоў Самсон з бацькам і маці ў Тымну. І калі падыходзілі яны да вінаграднікаў гораду, выскачыў малады леў і стаў насупраць яго.
6 І зыйшоў тады на Самсона Дух ГОСПАДА, і ён разьдзёр маладого ільва як казьляня, бо нічога ня меў у руках. Але бацьку і маці не сказаў, што зрабіў.
7 І ён прыйшоў, і размаўляў з жанчынай, якую ўпадабалі вочы ягоныя.
8 Праз нейкі час, калі ён вяртаўся, каб забраць яе, калі зыйшоў у бок, убачыў парэшткі ільва, і рой пчолаў на целеягоным, і плястар мёду.
9 І ўзяў яго ў рукі, і еў мёд у дарозе. І вярнуўся да бацькі і маці, і даў ім частку, і яны пакаштавалі. Але не хацеў ім казаць, што мёд узяў з цела ільва.
10 І бацька ягоны пайшоў да той жынчыны, і справіў там Самсон банкет, які звычайна спраўляюць нарачоныя.
11 А калі там убачылі яго, далі яму трыццаць вясельных сяброў, якія былі пры ім.
12 І зьвярнуўся да іх Самсон: «Загадаю я вам загадку. Калі разгадаеце мне яе за сем дзён банкету, я дам вам трыццаць шатаў ільняных і трыццаць зьменаў вопратак.
13 А калі ня зможаце разгадаць, вы дасьцё мне трыццаць шатаў ільняных і трыццаць зьменаў вопратак». Яны адказалі яму: «Загадвай загадку сваю, а мы будзем слухаць».
14 І ён сказаў ім: «З таго, хто есьць, выйшла тое, што [можна] зьесьці, а з дужага выйшла слодыч». І тры дні не маглі яны адгадаць загадкі.
15 Калі надыйшоў чацьвёрты дзень, сказалі яны жонцы Самсона: «Угавары мужа твайго, каб ён разгадаў нам загадку, а інакш спалім цябе і дом бацькі твайго. Ці вы на тое запрасілі нас сюды, каб абрабаваць нас?»
16 І плакала жонка Самсона перад ім, і казала: «Ненавідзіш ты мяне і не кахаеш, і таму загадкі, якую загадаў сынам народу майго, ня хочаш мне разгадаць». А ён сказаў: «Нават бацьку свайму і маці я не разгадаў бы яе. А як магу табе выявіць?»
17 І яна плакала перад ім сем тых дзён, калі спраўлялі банкет. У сёмы дзень нарэшце разгадаў ёй, бо яна вельмі дакучала яму. А яна як найхутчэй перадала гэта сынам народу свайго.
18 І яны ў сёмы дзень перад заходам сонца сказалі яму: «Што саладзейшае за мёд, і хто дужэйшы за льва». Ён жа ім сказаў: «Калі б вы не аралі ялаўкай маёй, не разгадалі б загадкі маёй».
19 І зыйшоў на яго Дух ГОСПАДА, і ён пайшоў у Ашкелён, і забіў там трыццаць чалавек, зьняў з іх адзеньне і аддаў тым, якія разгадалі загадку. І, разгневаны вельмі, вярнуўся ў дом бацькі свайго.
20 А жонка Самсона выйшла за вясельнага сябра ягонага, які быў пры ім.

Суд 15

1 Праз нейкі час, калі настаў дзень жніва пшаніцы, Самсон наведаў жонку сваю і прынёс ёй казьляня. Калі хацеў увайсьці да яе, бацька ейны забараніў яму,
2 кажучы: «Думаў я, што ты ненавідзіш яе, і таму аддаў яе сябру твайму. Але яна мае малодшую сястру, прыгажэйшую за яе. Няхай яна будзе табе за жонку».

3 І сказаў ім Самсон: «У такім выпадку ня буду вінаваты адносна Філістынцаў, калі буду ім
рабіць шкоду».
4 І пайшоў Самсон, і налавіў трыста лісаў, і ўзяў паходні, і прывязаў хвост да хваста, а
пасярэдзіне, між двума хвастамі, прычапіў па адной паходні.
5 І запаліў паходні, і пусьціў іх на збожжа Філістынскае, і спаліў ім снапы і няжатае збожжа, і
сады вінаградныя, і сады аліўкавыя.
6 І пыталіся Філістынцы: «Хто гэта зрабіў?» Ім адказалі: «Гэта Самсон, зяць аднаго чалавека
з Тымны, бо ён забраў у яго жонку і аддаў яе сябру ягонаму». І пайшлі Філістынцы, і спалілі
жанчыну і бацьку яе.
7 А Самсон сказаў ім: «Калі вы так робіце, дык я не супачыну, пакуль не адпомшчу вам».
8 І прынёс ім вялікае зьнішчэньне, перабіваючы сьцёгны і лыткі. І пайшоў, і жыў у пячоры ў
скале ў Этаме.
9 І пайшлі Філістынцы ў зямлю Юды, і разлажыліся там табарам, і да Лехі даходзілі войскі іхнія.
10 І сказалі ім людзі з пакаленьня Юды: «Чаму вы выйшлі супраць нас?» Яны адказалі:
«Прыйшлі мы, каб злавіць Самсона і адплаціць яму за тое, што ён нам зрабіў».
11 І тры тысячы мужчынаў з пакаленьня Юды пайшлі на вяршыню гары ў Этаме, і сказалі
Самсону: «Ці ты ня ведаеш, што Філістынцы пануюць над намі? Што ты нарабіў нам?» Ён
ім сказаў: «Як яны зрабілі мне, так і я ім зрабіў».
12 І сказалі яму: «Прыйшлі мы зьвязаць цябе і выдаць у рукі Філістынцаў». І сказаў ім Самсон:
«Прысягніце мне, што мяне не заб'ецё».
13 Яны сказалі: «Не заб'ём, але зьвязанага выдадзім цябе ім». І зьвязалі яго дзьвюма новымі
вяроўкамі, і зьвялі са скалы.
14 І так прыйшоў ён у Леху, і Філістынцы з крыкам выйшлі яму насустрач. І Дух ГОСПАДА
зыйшоў на яго, і вяроўкі, якімі былі зьвязаныя рукі ягоныя, зрабіліся як перагарэўшы лён, і
путы распаўзьліся і пападалі з рук ягоных.
15 І ён знайшоў сьвежю сківіцу асьліную, і схапіў яе рукою сваёй, і забіў ёю тысячу чалавек.
16 І сказаў Самсон: «Сківіцаю асьлінай я гару іх наваліў! Сківіцаю асьлінай тысячу чалавек я
забіў!»
17 А калі перастаў гаварыць, кінуў сківіцу і назваў тое месца Рамат-Лехі.
18 І адчуў вялікую смагу, і клікаў да ГОСПАДА, і сказаў: «Ты рукою слугі Твайго ўчыніў
вялікае збаўленьне і перамогу, а цяпер прыйдзецца мне памерці ад смагі і патрапіць у рукі
неабрэзаных».
19 І Бог адкрыў скалу ў Лехі, і выцекла адтуль вада. І ён напіўся вады, і набраўся сілы, і акрыяў.
Таму тую крыніцу назвалі Эн-Гаккорэ, і яна ў Лехі да сёньняшняга дня.
20 І быў ён судзьдзёю Ізраіля ў дні Філістынцаў дваццаць гадоў.

Суд 16

1 І пайшоў Самсон у Газу, і ўбачыў там распусьніцу, і прыйшоў да яе.
2 Калі паведамілі жыхарам Газы, што Самсон увайшоў у горад, яны акружылі яго і зрабілі
засаду на яго ў браме гораду. І ўсю ноч яны сядзелі ціха, каб, калі настане раніца, забіць яго.
3 А Самсон спаў да паўночы, а калі ўстаў, схапіў вароты гарадзкой брамы разам з засаўкамі
ейнымі, вырваў іх і палажыў сабе на плечы, і занёс на вяршыню гары, якая насупраць Хеўрону.
4 Пасьля гэтага Самсон закахаўся ў жанчыну, якая жыла ў лагчыне Сарэк і называлася Даліла.
5 І прыйшлі да яе валадары Філістынцаў, і сказалі: «Ашукай яго і даведайся, адкуль сіла ягоная
вялікая і як нам перамагчы яго, і зьвязаць яго, і ўпакорыць яго. Калі гэта зробіш, дамо табе за
гэта тысячу і сто срэбнікаў кожны».
6 І сказала Даліла Самсону: «Скажы мне, калі ласка, адкуль у цябе бярэцца такая сілавялікая і
чым можна зьвязаць цябе, каб упакорыць цябе?»
7 Самсон сказаў ёй: «Калі зьвязаць мяне сямю сырымі шнурамі, якія яшчэ ня сушаныя, я
зраблюся бясьсільным і стану, як іншыя людзі».

8 І прынесьлі ёй валадары Філістынцаў сем сырых шнуроў, якія былі ня сушаныя, і яна зьвязала
імі яго.
9 А яны схаваліся ў другім пакоі, і яна крыкнула: «Філістынцы над табою, Самсон!» І ён
паразрываў шнуры як нітку зрэбную, апаленую агнём. І не даведалася яна, у чым сіла ягоная.
10 І сказала Даліла Самсону: «Падмануў ты мяне і схлусіў мне. Прынамсі цяпер скажы мне,
чым ты павінен быць зьвязаны».
11 Ён сказаў ёй: «Калі буду зьвязаны дзевяцьцю вяроўкамі, якія не былі ва ўжытку, буду слабы,
як іншыя людзі».
12 І ўзяла Даліла новыя вяроўкі, і зьвязала яго, і крыкнула: «Філістынцы над табой, Самсон!»
А ў другім пакоі была схаваўшыся засада, але ён разарваў вяроўкі на руках сваіх як ніткі.
13 І сказала Даліла Самсону: «Дакуль ты будзеш падманваць мяне і фальшыва гаварыць?
Скажы, чым цябе трэба зьвязаць?» Самсон адказаў ёй: «Калі ты ўпляцеш сем косаў галавы
маёй у тканіну».
14 І яна прыбіла [косы ягоныя] да калоды, і крыкнула яму: «Філістынцы над табою, Самсон!»
І ён устаў зо сну, і вырваў цьвікі разам з тканінаю.
15 І сказала Даліла: «Як жа можаш ты казаць, што кахаеш мяне, калі душа твая не са мною?
Тры разы схлусіў ты мне і не хацеў сказаць, у чым сіла твая вялікая».
16 І калі яна так штодзень дакучала і мучыла ўсьцяж яго, душа ягоная самлела аж да сьмерці і
зьнемагла.
17 І адкрыў ён усё сэрца сваё, і сказаў ёй: «Ніколі галавы маёй не дакраналася лязо, бо я — назір
Божы ад улоньня маці маёй. Калі абгаліць мне [галаву], адыйдзе ад мяне сіла мая, і я стануся
слабы, як іншыя людзі».
18 І ўбачыла Даліла, што ён адкрыў ёй усё сэрца сваё, і паслала па валадароў Філістынцаў,
кажучы: «Прыйдзіце яшчэ раз, бо адкрыў ён цяпер мне ўсё сэрца сваё». Яны прыйшлі, узяўшы
срэбра, якое ёй абяцалі.
19 І яна ўсьпіла яго на каленях сваіх, і паклікала чалавека, і загадала яму абгаліць сем косаў
галавы ягонай, і ён стаў слабець, і адыйшла ад яго сіла ягоная.
20 І сказала яна: «Філістынцы над табой, Самсон!» Ён абудзіўся зо сну свайго і падумаў у душы
сваёй: «Пайду як раней і вызвалюся», ня ведаючы, што ГОСПАД адыйшоў ад яго.
21 І схапілі яго Філістынцы, і адразу выкалалі яму вочы, і завялі ў Газу, дзе, прыкуты двума
ланцугамі мядзянымі, мусіў ён малоць зерне ў вязьніцы.
22 Тым часам раней зголеныя валасы сталі ў яго адрастаць.
23 А валадары Філістынцаў сабраліся ўсе, каб скласьці ахвяру богу свайму Дагону і
павесяліцца. Яны казалі: «Бог наш аддаў у рукі нашыя ворага нашага, Самсона».
24 І народ, бачачы яго, хваліў бога свайго і казаў: «Аддаў бог наш у рукі нашыя ворага нашага,
які нішчыў зямлю нашую і многіх з нас забіў».
25 І калі яны ўзьвесяліліся, запатрабавалі паклікаць Самсона, каб ён іх забаўляў. І ён,
прыведзены з вязьніцы, мусіў забаўляць іх. І паставілі яго стаяць паміж слупамі.
26 І сказаў Самсон юнаку, які трымаў яго за руку: «Пусьці мяне, каб мог я дакрануцца слупоў,
на якія абапіраецца дом, каб да іх прыхіліцца».
27 А дом той быў поўны мужчынаў і жанчынаў, бо былі там усе князі Філістынскія, а на даху
было каля трох тысячаў мужчынаў і жанчынаў, якія глядзелі на Самсона, калі той забаўляў іх.
28 І Самсон усклікнуў да ГОСПАДА, кажучы: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ, узгадай пра мяне і вярні мне
хоць у гэты раз даўнейшую сілу маю, каб я мог адпомсьціць Філістынцам за двое вачэй маіх!»
29 І Самсон узяўся за два слупы сярэднія, на якіх стаяў дом, і абапёрся на іх, на адзін правай
рукой, а на другі — левай рукой.
30 І сказаў Самсон: «Няхай памрэ душа мая разам з Філістынцамі!» І страсянуў ён моцна
слупы, і ўпаў дом на ўсіх князёў, і на ўсіх іншых, якія там былі. І тых, якіх ён тады забіў,
сам гінучы, было болей, чым тых, якіх ён пазабіваў у час усяго жыцьця свайго.
31 І прыйшлі браты ягоныя і ўвесь дом бацькі ягонага, каб забраць яго. І вярнуліся, і пахавалі
яго паміж Цораю і Эштаолам у магіле бацькі ягонага, Маноаха. А судзіў ён Ізраіль дваццаць
гадоў.

Суд 17

1 У гарах Эфраіма быў нейкі чалавек на імя Міха.
2 І ён сказаў маці сваёй: «Тысяча і сто срэбнікаў, якія ў цябе ўкрадзеныя і дзеля якіх ты праклінала і казала, каб я чуў, яны ў мяне, гэта я іх узяў». Яна яму сказала: «Няхай ГОСПАД дабраславіць сына майго!»
3 І вярнуў ён іх маці сваёй, якая сказала яму: «Гэтае срэбра я прысьвяціла ГОСПАДУ, з рукі маёй прызначана яно для сына майго, каб з яго зрабілі [ідала] рэзьбленага і літага з мэталю. А цяпер я аддаю яго табе».
4 Але ён зьвярнуў тыя срэбнікі маці сваёй. І маці ягоная ўзяла дзьвесьце срэбнікаў, і дала іх залатару, каб зрабіў з іх ідала рэзьбленага і літага з мэталю, які быў пасьля ў доме Міхі.
5 І ён меў у сябе бажніцу, і зрабіў эфод і тэрафімаў, і пасьвяціў аднаго з сыноў сваіх, каб быў ён у яго сьвятаром.
6 У тыя дні не было валадара ў Ізраілі, і кожны рабіў тое, што было слушным у вачах ягоных.
7 Быў адзін юнак у Бэтлееме Юдэйскім у пакаленьні Юды, а быў ён лявіт і жыў там як прыхадзень.
8 І чалавек той пакінуў горад Бэтлеем Юдэйскі, і пайшоў вандраваць дзе прыдзецца. І вандруючы, дайшоў ён аж да гары Эфраіма ў дом Міхі.
9 І Міха сказаў яму: «Адкуль ты паходзіш?» Ён сказаў яму: «Я — лявіт з Бэтлеему Юдэйскага, і шукаю месца, дзе абжыцца».
10 І сказаў яму Міха: «Застанься ў мяне, і будзь мне бацькам і сьвятаром, а я дам табе штогод дзесяць срэбнікаў, патрэбнае адзеньне і ежу».
11 І спадабалася таму лявіту жыць у чалавека таго, і ён стаўся яму як адзін з сыноў ягоных.
12 І Міха пасьвяціў таго лявіта, і меў таго юнака як сьвятара, і ён жыў у доме Міхі.
13 І сказаў Міха: «Цяпер я ведаю, што ГОСПАД будзе рабіць мне добрае, бо я маю лявіта сьвятаром».

Суд 18

1 У той час не было валадара ў Ізраілі, а калена Дана шукала сабе зямлі ў спадчыну, бо аж да гэтага дня не была выдзелена ім спадчына сярод каленаў Ізраіля.
2 І выправілі сыны Дана з межаў пакаленьня свайго пяць чалавек, людзей мужных, з Цоры і Эштаолу, каб выведалі зямлю і пільна разгледзелі яе. І сказалі ім: «Ідзіце і выведайце зямлю гэтую». І прыйшлі яны аж на гару Эфраіма, аж да дому Міхі, і там заначавалі.
3 Калі яны былі блізка дому Міхі, пазналі яны голас юнака лявіта і, зыйшоўшы там з дарогі, спыталіся ў яго: «Хто цябе сюды прывёў? Што ты тут робіш? Што тут у цябе?»
4 Ён сказаў ім: «Гэта і гэта зрабіў для мяне Міха, і за плату наняў мяне, каб я быў яму сьвятаром».
5 І прасілі яны яго: «Спытайся ў Бога, каб мы маглі ведаць, ці дарога, якую мы выбралі, будзе мець посьпех».
6 І ён сказаў ім: «Ідзіце ў супакоі. ГОСПАДУ даспадобы дарога вашая, і падарожжа, у якое вы выбраліся».
7 І пайшлі тыя пяць чалавек, і прыбылі ў Ляіш, і ўбачылі народ, які жыве без аніякага страху па звычаю Сідонцаў, у бясьпецы і ў супакоі, бо не было нікога, хто нападаў бы на зямлю іхнюю. І Сідонцы былі ад іх далёка, і ня мелі яны ніякіх справаў з Асурам.
8 І прыйшлі яны да братоў сваіх у Цору і Эштаол, а тыя спыталіся ў іх: «Што вы [скажаце]?»
9 Яны сказалі: «Устаньце і пойдзем супраць іх. Бо мы бачылі зямлю вельмі багатую і ўраджайную. Чаго вы сядзіце? Не марудзьце, пойдзем і здабудзем зямлю гэтую.
10 Пойдзем да людзей, [якія жывуць] у бясьпецы, і ў зямлю прасторную. І дасьць Бог у рукі нашыя месца, дзе няма ніякай нястачы ўсяго, што ёсьць на зямлі».
11 І вырушылі адтуль з пакаленьня Дана з Цоры і Эштаолу шэсьцьсот чалавек, узброеных да бою.

12 Яны пайшлі і разлажыліся табарам у Кірыят-Ярыме ў Юдэі. І тое месца з таго дня называюць
Табар Дана, і знаходзіцца яно на захад ад Кірыят-Ярыму.
13 Адтуль пайшлі яны на гару Эфраіма і прыйшлі ў дом Міхі.
14 І пяць чалавек, якія раней пасланыя былі для выведкі зямлі Ляіш, сказалі братам сваім: «Ці
ведаеце, што ў дамах гэтых ёсьць эфод і тэрафімы, рэзьблены [ідал] і [ідал], выліты з мэталю?
І цяпер ведаеце, што рабіць».
15 І зьвярнулі туды, і ўвайшлі ў дом юнака лявіта, у дом Міхі, і прывіталі яго [словамі] мірнымі.
16 А шэсьцьсот чалавек, якія былі ўзброеныя, стаялі перад брамай; былі гэта сыны Дана.
17 І тыя пяцёра, што былі раней пасланыя выведаць зямлю, узялі рэзьбленую [выяву], эфод,
тэрафіма і літога [ідала]. А сьвятар стаяў перад брамай, і побач сталі шэсьцьсот чалавек
узброеных.
18 І яны ўвайшлі ў дом Міхі, і ўзялі рэзьбленую [выяву], эфод, тэрафіма і літога [ідала]. І сказаў
ім сьвятар: «Што вы робіце?»
19 А яны яму сказалі: «Маўчы! Палажы палец на вусны свае і хадзі з намі, каб мелі мы ў табе і
бацьку, і сьвятара. Як табе лепей, быць сьвятаром у доме аднаго чалавека, ці быць сьвятаром
калена і роду Ізраіля?»
20 І ўзрадаваўся сьвятар, і ўзяў эфод, тэрафімаў, а таксама рэзьбленага [ідала], і пайшоў з
народам гэтым.
21 І яны вярнуліся, і пайшлі далей, а перад сабой пусьцілі ісьці дзяцей, жывёлу і ўсю маёмасьць
сваю.
22 Калі яны былі ўжо далёка ад дому Міхі, мужчыны, якія жылі ў ваколіцах каля Міхі, сабраліся
і дагналі сыноў Дана,
23 і ззаду за імі паднялі крык. Тыя павярнуліся і сказалі да Міхі: «Што табе? Чаго крычыш?»
24 Ён сказаў: «Бога майго, якога я зрабіў сабе, вы забралі, і сьвятара, і ўсё, што маю, і яшчэ
кажаце: “Што табе?”»
25 І сказалі яму сыны Дана: «Каб больш ня чулі мы голасу твайго за сабою, каб людзі нашыя са
злосьці ня кінуліся на цябе. Забірай душу тваю і душы дому твайго».
26 І сыны Дана пайшлі дарогаю сваёй, а Міха, бачачы, што яны мацнейшыя за яго, вярнуўся ў
дом свой.
27 А тыя шэсьцьсот чалавек узялі тое, што зрабіў Міха, і сьвятара ягонага, і прыйшлі ў Ляіш, да
народу, [які жыве] ў супакоі і бясьпецы, і забілі яго вострывам мяча, а горад спалілі агнём.
28 І ніхто ня мог ім дапамагчы, бо яны далёка жылі ад Сідону і ня мелі ніякіх справаў з Асурам.
Гэты горад быў у лагчыне ў Бэт-Рэхове, і [сыны Дана] адбудавалі яго нанова, і жылі ў ім.
29 І назвалі горад гэты Дан, ад імя Дана, бацькі свайго, народжанага Ізраілем. Раней гэты горад
называўся Ляіш.
30 Сыны Дана паставілі сабе рэзьбленага ідала, а Ёнатан, сын Гершома, сына Майсея, і сыны
ягоныя былі сьвятарамі ў пакаленьні Дана аж да дня выгнаньня [ў няволю] зямлі гэтай.
31 І рэзьблены [ідал], якога зрабіў Міха, заставаўся ў іх увесь час, калі Дом Божы быў у Шыло.

Суд 19

1 У тыя дні не было валадара ў Ізраілі. І быў нейкі лявіт, які як прыхадзень [жыў] на ўзбоччы
гары Эфраіма. І меў ён наложніцу з Бэтлеему Юдэйскага.
2 Яна з ім пасварылася і вярнулася да бацькі свайго ў Бэтлеем, і заставалася ў яго чатыры
месяцы.
3 І пайшоў за ёю муж ейны, хочучы прамовіць да сэрца ейнага і вярнуць яе да сябе. І меў ён з
сабой слугу і двух аслоў. Яна прыняла яго і завяла ў дом бацькі свайго. Калі бацька яе ўбачыў
[зяця], узрадаваўся і выйшаў яму на спатканьне.
4 І затрымаў яго там, і заставаўся зяць у доме цесьця тры дні, балюючы з ім па-сяброўску і
выпіваючы.
5 У чацьвёрты дзень, калі ён устаў раніцай і меўся ісьці, цесьць сказаў яму: «Падсілкуйся
хлебам, умацуйся, а потым пойдзеш у дарогу».

6 І зноў сядзелі яны разам абодва, елі і пілі. І бацька той жанчыны сказаў зяцю свайму: «Прашу
цябе, таксама сёньня пабудзь тут, і няхай радуецца сэрца тваё».
7 Але ён устаў і зьбіраўся ісьці, і ўсё адно цесьць затрымаў яго ў сябе яшчэ на адну ноч.
8 Калі настала раніца, на пяты дзень, лявіт зьбіраўся ў дарогу, але цесьць зноў сказаў яму:
«Прашу цябе, умацуй сэрца сваё». І марудзілі да канца дня, і абодва частаваліся разам.
9 І ўстаў той чалавек, каб разам з жонкай сваёй і слугою варочацца, але цесьць, бацька
жанчыны, стаў угаворваць яго: «Падумай, дзень ужо хіліцца на вечар. Застаньцеся ў мяне
сёньня. Пераначуйце тут, і няхай будзе добра на сэрцы тваім, а заўтра раніцаю вырушыце ў
дарогу, каб вярнуцца ў дом свой».
10 Але зяць не паддаўся намовам ягоным, і адразу выбраўся ў дарогу, і прыйшоў у Евус,
значыць у Ерусалім, і [былі] ў яго два аслы асядланыя, і наложніца з ім.
11 Ужо былі яны каля Евусу, і вечарэла. І сказаў слуга гаспадару свайму: «Хадзем, завернем у
горад Евусэяў і затрымаемся там».
12 І адказаў яму гаспадар: «Не, ня пойдзем у горад чужынцаў, бо яны не з сыноў Ізраіля, але
пройдзем аж у Гіву».
13 І сказаў слузе свайму: «Хадзем, дабярэмся да нейкай мясцовасьці ў Гіве або ў Раме, і там
затрымаемся».
14 І мінулі яны Евус, і працягвалі пачатую дарогу. І зайшло ім сонца каля Гівы, што належыць
да Бэн'яміна.
15 І завярнуліся яны туды, каб там пераначаваць. Але калі туды заехалі і сядзелі на плошчы
гораду, ніхто не хацеў прыняць іх на ноч.
16 У той дзень адзін стары вяртаўся ўвечары з працы сваёй у полі. Ён быў з гары Эфраіма і як
прыхадзень жыў у Гіве. А ў тым горадзе людзі былі з сыноў Бэн'яміна.
17 І падняў ён вочы свае, і ўбачыў падарожнага чалавека, які сядзеў на плошчы гораду, і
спытаўся ў яго той стары: «Адкуль ты і куды ідзеш?»
18 Той адказаў яму: «Мы ідзем з Бэтлеему Юдэйскага аж на ўзбоччы гары Эфраіма, адкуль
былі пайшоўшы ў Бэтлеем Юдэйскі. І цяпер вяртаемся да Дому ГОСПАДА, але ніхто ня хоча
прыняць нас у дом.
19 Маем салому, папас для аслоў нашых, хлеб і віно для мяне, для служкі тваёй і для юнака
гэтага, які са слугою тваім. Нічога не патрабуем».
20 І сказаў стары: «Супакой табе! Я дам табе ўсё, што патрэбна, толькі не начуй на плошчы».
21 І завёў яго ў дом свой, даў мяшанку аслам, і памылі ногі свае, і елі, і пілі.
22 Калі яны ўзьвесялілі сэрца сваё, вось, мужчыны гораду таго, сыны Бэліяла, акружылі дом
старога, і пачалі грукаць у дзьверы, крычучы: «Выведзі нам мужчыну, які зайшоў у дом твой,
мы хочам пазнаць яго».
23 І выйшаўшы да іх стары, і сказаў: «Не рабіце, браты, гэтага ліха, бо прыйшоў да мяне чалавек
у госьці, не рабіце гэтай ганьбы.
24 Маю дачку дзяўчыну, а гэты чалавек мае наложніцу; выведу іх да вас, і вы рабіце з імі, што
добра ў вачах вашых, а чалавеку гэтаму не рабіце ганьбы».
25 Але людзі тыя і слухаць яго не хацелі. І ўзяў той чалавек наложніцу сваю, і вывеў яе да іх, і
яны пазналі яе, і гвалтавалі яе ўсю ноч аж да раніцы.
26 І прыйшла жанчына тая на сьвітаньні, і ўпала каля ўваходу ў дом, дзе быў гаспадар ейны, і
там [ляжала] да сьвятла [дня].
27 Раніцаю ўстаў гаспадар ейны і адчыніў дзьверы дому, каб далей ісьці ў дарогу. І вось,
наложніца ягоная ляжыць перад уваходам, і рукі ейныя на парозе.
28 Ён сказаў ёй: «Уставай, пойдзем». Але яна нічога не адказала. І ён узяў яе, і палажыў на
асла, і вярнуўся ў дом свой.
29 І прыйшоў у дом свой, і схапіў нож, і пасек цела наложніцы сваёй на дванаццаць частак, і
разаслаў у-ва ўсе межы Ізраіля.
30 І ўсе бачылі гэта, і казалі: «Ніколі гэтага не было і не было бачана нічога падобнага ад дня,
у які сыны Ізраіля выйшлі з Эгіпту аж да сёньняшняга дня! Зьвярніце ўвагу на гэта і скажыце,

што рабіць».

Суд 20

1 І выйшлі ўсе сыны Ізраіля, і як адзін чалавек сабралася грамада ад Дану аж да Бээр-Шэвы
разам з зямлёй Гілеад да ГОСПАДА ў Міцпу.
2 І сабраліся правадыры ўсяго народу і ўсе калены Ізраіля на супольны сход народу Божага, а
[было] іх чатырыста тысячаў пешых ваяроў, узброеных мячом.
3 І пачулі сыны Бэн'яміна, што сабраліся сыны Ізраіля ў Міцпе. І пыталіся сыны Ізраіля [ў
лявіта], як гэтае злачынства адбылося.
4 І лявіт, муж замучанай жанчыны, адказаў: «Прыйшоў я з наложніцай маёй у Гіву, што
[належыць] да Бэн'яміна, каб пераночць.
5 І гаспадары Гівы паўсталі супраць мяне, і ўначы атачылі дом, хочучы мяне забіць, а
наложніцу маю гвалтавалі, і яна памерла.
6 І я ўзяў наложніцу маю, і пасек яе на часткі, і паслаў у-ва ўсе межы спадчыны Ізраіля, бо яны
ўчынілі ганебнае і агіднае ў Ізраілі.
7 І цяпер вы ўсе, сыны Ізраіля, дайце слова і раду [ў гэтай справе]?»
8 І паўстаў увесь народ як адзін чалавек, кажучы: «Ніхто з нас ня пойдзе ў намёт свой, і ніхто
ня пойдзе ў дом свой!
9 Але супольна выступім супраць Гівы паводле жэрабя.
10 І з кожнага калена Ізраіля выбярэм дзесяць чалавек са ста, і сто — з тысячы, і тысячу — з
дзесяці тысячаў. Яны будуць рупіцца пра харчы для войска, якое выправіцца зрабіць з Гівай
Бэн'ямінавай адпаведна ганьбы, якую яны ўчынілі ў Ізраілі».
11 І зыйшоўся ўвесь Ізраіль супраць гораду таго, усе разам, як адзін чалавек.
12 І паслалі калены Ізраіля людзей да ўсяго калена Бэн'яміна, кажучы: «Што за ліхота
адбываецца сярод вас!
13 Выдайце цяпер тых людзей, сыноў Бэліяла, з Гівы, і мы заб'ем іх і вынішчым зло з Ізраіля».
Але сыны Бэн'яміна не хацелі слухаць голас братоў сваіх, сыноў Ізраіля.
14 І сабраліся сыны Бэн'яміна з усіх гарадоў у Гіву, каб ваяваць супраць сыноў Ізраіля.
15 У той дзень налічана было сыноў Бэн'яміна, што прыйшлі з іншых гарадоў і ўзброеных
мячом, дваццаць шэсьць тысячаў, апрача жыхароў Гівы, з якіх было налічана семсот
выбранцоў.
16 У-ва ўсім гэтым войску было семсот выбранцоў, якія не карысталіся правай рукой і якія
кідалі з пушчалкі камянём так, што воласа не міналі.
17 А ваяроў Ізраіля без [сыноў] Бэн'яміна, налічвалася чатырыста тысячаў узброеных мячом і
здольных да бою.
18 І паўсталі яны, і пайшлі ў Бэтэль, і пыталіся ў Бога. І казалі сыны Ізраіля: «Хто першым з
нас пойдзе ў бой супраць сыноў Бэн'яміна?» І ГОСПАД ім сказаў: «Юда [пойдзе] першы».
19 На сьвітаньні вырушылі сыны Ізраіля і разлажыліся табарам насупраць Гівы.
20 І сталі ў шыхт сыны Ізраіля супраць Бэн'яміна, і пачалі ваяваць сыны Ізраіля супраць Гівы.
21 Але ў той дзень сыны Бэн'яміна выйшлі з Гівы і забілі спасярод сыноў Ізраіля дваццаць дзьве
тысячы чалавек.
22 І сыны Ізраіля набраліся мужнасьці, і ў тым самым месцы, дзе раней ваявалі,
падрыхтаваліся да бою.
23 І пайшлі сыны Ізраіля [ў Бэтэль], і плакалі перад ГОСПАДАМ аж да вечара, і пыталіся ў
ГОСПАДА, кажучы: «Ці маем мы далей ваяваць з сынамі Бэн'яміна, братамі нашымі?» І
ГОСПАД сказаў: «Ваюйце супраць іх».
24 І на другі дзень сыны Ізраіля пайшлі на сыноў Бэн'яміна.
25 І сыны Бэн'яміна выйшлі з Гівы, і ў другі дзень забілі васямнаццаць тысячаў спасярод сыноў
Ізраіля, узброеных мячом.

26 І ўсе сыны Ізраіля, і ўвесь народ пайшлі ў Бэтэль, і прыйшлі, і плакалі, і сядзелі перад абліччам ГОСПАДА, і посьцілі ў той дзень аж да вечара, і складалі ахвяры цэласпаленьня і
ахвяры мірныя перад абліччам ГОСПАДА.
27 І пыталіся сыны Ізраіля ў ГОСПАДА. А ў тыя дні быў там Каўчэг Запавету Божага.
28 І стаў тады Пінхас, сын Элеазара, сына Аарона, кажучы: «Ці павінны мы яшчэ ісьці ваяваць
супраць сыноў Бэн'яміна, братоў нашых, ці не?» І ГОСПАД сказаў: «Ідзіце ваяваць, бо Я заўтра
аддам іх у рукі вашыя».
29 І сыны Ізраіля паставілі кругом Гівы засады.
30 На трэці дзень пайшлі сыны Ізраіля супраць сыноў Бэн'яміна і, падобна як першы раз, сталі
ў шыхт насупраць Гівы.
31 І сыны Бэн'яміна выступілі супраць народу, і адыйшліся ад гораду, і пачалі як раней забіваць
ваяроў на дарогах, з якіх адна ідзе ў Бэтэль, а другая — у Гіву, і на палях, і [загінула] каля
трыццаці ваяроў.
32 І казалі сыны Бэн'яміна: «Як і ў першы раз, будуць яны пераможаныя», а сыны Ізраіля казалі:
«Уцякайма, каб адвесьці іх ад гораду на тыя дарогі».
33 І ўсе ваяры Ізраіля, устаўшы з месца свайго, сталі ў шыхт у Баал-Тамар. І засады выйшлі са
сховаў на раўніне Гівы.
34 І выйшлі супраць Гівы дзесяць тысячаў выбранцоў з усяго Ізраіля, і пачалася цяжкая бітва.
А [сыны Бэн'яміна] не разумелі, што чакае іх параза.
35 І пабіў ГОСПАД Бэн'яміна перад абліччам Ізраіля, і выбілі ў той дзень сыны Ізраіля ў
Бэн'яміна дваццаць пяць тысячаў сто чалавек, узброеных мячом.
36 І сыны Бэн'яміна ўбачылі, што яны пераможаныя. А сыны Ізраіля далі ім прастору ўцякаць,
бо давяралі засадзе, якая хавалася каля Гівы.
37 У той час выступілі тыя, што хаваліся ў засадзе, і напалі на Гіву, і ўварваліся ў горад, і
пазабівалі вострывам мяча ўсіх у горадзе.
38 А сыны Ізраіля былі дамовіўшыся з тымі, якія былі ў засадзе, што мелі з гораду выпусьціць
дым як знак.
39 І сыны Ізраіля пачалі ўцякаць у часе бою, а [сыны] Бэн'яміна забілі з сыноў Ізраіля каля
трыццаці чалавек, і казалі: «Перамагаючы, пераможам іх, як у папярэднім баі».
40 А з гораду стаў падымацца слуп дыму. І сыны Бэн'яміна павярнуліся, і вось, полымя з гораду
падымаецца ў неба.
41 І сыны Ізраіля павярнуліся, а ваяры Бэн'яміна стрывожыліся, бо бачылі, што прыйшла да іх
бяда.
42 І пачалі яны ўцякаць перад сынамі Ізраіля дарогай у бок пустыні, але войска дагнала іх. І
тыя, што выйшлі з гораду, забівалі іх пасярод сябе.
43 І атачылі яны з усіх бакоў Бэн'яміна, і гналі іх без адпачынку, і забівалі іх ад Гівы на захад.
44 І палегла ў Бэн'яміна васямнаццаць тысячаў чалавек, усе ваяры мужныя.
45 З тых, якія ўцякалі ў бок пустыні да скалы Рымон, забілі на дарогах пяць тысячаў чалавек, і
гналі іх да Гідому, дзе забілі каля дзьвюх тысячаў.
46 І ўсіх Бэн'ямінцаў палегла ў той дзень дваццаць пяць тысячаў мужчынаў, узброеных мячом,
усе ваяры мужныя.
47 А тыя шэсьцьсот чалавек, што засталіся, уцяклі да скалы Рымон, і заставаліся на скале
Рымон чатыры месяцы.
48 А сыны Ізраіля вярнуліся да сыноў Бэн'яміна, і выбілі вострывам мяча, ад мужчынаў аж да
быдла і да ўсяго, што знайшлі. Таксама ўсе гарады і мясцовасьці іхнія спалілі агнём.

Суд 21

1 І ў Міцпе сыны Ізраіля зложылі прысягу: «Ніхто з нас ня дасьць дачкі сваёй [сынам] Бэн'яміна
за жонку».
2 І пайшоў народ у Бэтэль, і перад абліччам Бога былі аж да вечара, галосячы і плачучы плачам
вялікім.

3 І казалі: «Чаму, ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, сталася, што ў народзе Тваім сёньня ня стала ў
Ізраіля аднаго калена?»
4 І назаўтра, устаўшы на сьвітаньні, паставілі ахвярнік і склалі на ім ахвяры цэласпаленьня і
ахвяры мірныя.
5 І сказалі сыны Ізраіля: «Хто з усіх каленаў Ізраіля не прыйшоў на супольны сход перад
ГОСПАДАМ?» Бо зьвязаліся яны ўрачыстаю прысягаю, што сьмерцю памрэ той, хто ня прыйдзе
ў Міцпу да ГОСПАДА.
6 І сыны Ізраіля шкадавалі дзеля брата свайго Бэн'яміна, і казалі: «Ня стала сёньня аднаго
калена ў Ізраілі.
7 Што мы зробім, каб тыя, што засталіся, [мелі] жонак? Бо ўсе мы прысягалі перад ГОСПАДАМ,
што не дамо ім за жонак дочак нашых».
8 І сказалі яны: «Якое з усіх каленаў Ізраіля не прыйшло да ГОСПАДА ў Міцпу?» І вось з Ябэш
Гілеадзкага ніхто не прыйшоў на супольны сход у табар.
9 І народ быў пералічаны, і вось, нікога не было з жыхароў Ябэшу Гілеадзкага.
10 І грамада паслала туды дванаццаць тысячаў ваяроў мужных, і загадала ім: «Ідзіце і забіце
жыхароў Ябэшу Гілеадзкага вострывам мяча, і жанчын, і дзяцей іхніх.
11 І вось што зробіце: усіх мужчынаў і жанчынаў, якія пазналі мужа, пазабівайце».
12 І знайшлі яны сярод жыхароў Ябэшу чатырыста дзяўчат, якія не пазналі мужа, і прывялі іх
у табар у Шыло ў зямлі Ханаан.
13 І грамада паслала да сыноў Бэн'яміна, якія былі на скале Рымон, каб аб'явіць ім мір.
14 І вярнуліся сыны Бэн'яміна ў той час, і далі ім жонак з дачок Ябэшу Гілеадзкага, але не хапіла
для іх усіх.
15 І народ вельмі моцна шкадаваў дзеля Бэн'яміна, што ГОСПАД зрабіў вылом у каленах Ізраіля.
16 І сказалі старшыні грамады: «Што зробім з рэштаю, якія не атрымалі жонак? Бо ўсе
жанчыны ў Бэн'яміна загінулі».
17 І сказалі яны: «Спадчынная зямля застаецца ацалелым [сынам] Бэн'яміна, каб не прапала
адно калена ў Ізраілі.
18 Дачок сваіх мы ня можам ім даць, бо мы зьвязаныя прысягаю, бо прысягнулі сыны Ізраіля:
"Пракляты, хто дасьць жонку Бэн'яміну!"»
19 І сказалі: «Кожны год бывае сьвята ГОСПАДА ў Шыло, які на поўнач ад Бэтэлю, а на захад ад
дарогі, што ідзе з Бэтэлю ў Сыхем, і на поўдзень ад Лебоны».
20 І загадалі яны сынам Бэн'яміна, кажучы: «Ідзіце і схавайцеся ў вінаградніках.
21 Калі ўбачыце дзяўчатаў з Шыло, якія выйшлі ў карагодах танчыць, выходзьце з
вінаграднікаў і хапайце іх, кожны сабе жонку спасярод дочак Шыло, і вядзіце ў зямлю
Бэн'яміна.
22 Калі ж бацькі іхнія або браты прыйдуць да нас жаліцца, мы скажам ім: "Пашкадуйце іх, бо
не здабылі мы ім жонак на вайне, а вы таксама, калі б ім далі, саграшылі б"».
23 І сыны Бэн'яміна зрабілі так, і ўзялі жонак паводле ліку свайго, з тых, якія танчылі. І
вярнуліся яны ў спадчыну сваю, і адбудавалі гарады свае, і жылі ў іх.
24 І сыны Ізраіля вярнуліся адтуль кожны да калена свайго і да сям'і сваёй, і пайшлі кожны ў
спадчыну сваю.
25 У тыя дні не было валадара ў Ізраілі, і кожны рабіў тое, што было слушна ў вачах ягоных.

КНІГА РУТ

1 І было ў дні, калі судзілі судзьдзі, і быў голад на зямлі, і пайшоў чалавек з Бэтлеему Юдэйскага
жыць на палях Мааву, ён, і жонка ягоная, і два сыны ягоныя.
2 І [было] імя чалавека Элімэлех, а імя жонкі — Наомі, а імёны двух сыноў ягоных — Махлон і
Кільён з Эфраты, з Бэтлеему Юдэйскага. І прыйшлі яны на палі Мааву, і былі там.
3 І памёр Элімэлех, муж Наомі, і засталася яна і два сыны ейныя.
4 І ўзялі яны сабе жонак Мааўлянак, імя адной — Орпа, а імя другой — Рут. І яны жылі там
гадоў дзесяць.
5 І памерлі таксама Махлон і Кільён, і засталася жанчына без дзяцей і бяз мужа.
6 І ўстала яна, і нявесткі яе, і вярнуліся з палёў Мааву, бо пачула яна на палях Мааву, што
ГОСПАД наведаў народ Свой і даў ім хлеб.
7 І выйшла яна з месца, у якім была, і дзьве нявесткі ейныя з ёй, і яны пайшлі па дарозе назад
у зямлю Юды.
8 І сказала Наомі двум нявесткам сваім: «Ідзіце, няхай [кожная] жанчына вернецца ў дом маці
сваёй. Няхай зьявіць вам ГОСПАД міласэрнасьць, як вы зьявілі памерлым сваім і мне.
9 Няхай дасьць вам ГОСПАД знайсьці спакой жаночы ў доме мужа свайго». І яна пацалавала
іх, а яны ўзьнялі голас свой і заплакалі.
10 І сказалі яны ёй: «Мы вернемся з табою да народу твайго».
11 І сказала Наомі: «Вяртайцеся, дочкі мае. Навошта вы пойдзеце са мною? Ці ж маю я сыноў
ва ўлоньні маім, каб яны сталіся мужамі для вас?
12 Вяртайцеся, дочкі мае, ідзіце. Бо я занадта старая, каб выйсьці замуж, нават калі б я сказала:
“Ёсьць для мяне надзея”, і таксама ў гэту ноч выйшла замуж, і нарадзіла сыноў,
13 ці будзеце вы чакаць, пакуль яны вырастуць? Ці дзеля іх вы ня выйдзеце замуж? Не, дочкі
мае. Вельмі горка мне з-за вас, бо зьвернута на мяне рука ГОСПАДА».
14 І яны ўзьнялі голас свой, і плакалі. І Орпа пацалавала сьвякруху сваю, а Рут засталася з ёю.
15 І сказала [Наомі]: «Вось, швагерка твая вярнулася да народу свайго і багоў сваіх. Вяртайся
і ты за швагеркай тваёй».
16 І сказала Рут: «Не прымушай мяне, каб я пакінула цябе і зыйшла ад цябе. Куды ты пойдзеш,
туды я пайду, дзе ты будзеш жыць, там я буду жыць. Народ твой будзе народам маім, і Бог
твой будзе Богам маім.
17 Дзе ты памрэш, там я памру, і там буду пахаваная. Няхай гэта зробіць мне ГОСПАД і няхай
яшчэ дадасьць, бо [толькі] сьмерць аддзеліць мяне ад цябе».
18 І ўбачыла [Наомі], што [Рут] вырашыла ісьці з ёю, і перастала адгаворваць яе.
19 І ішлі абедзьве разам, аж прыйшлі ў Бэтлеем. І было, калі прыйшлі ў Бэтлеем, увесь горад
узрушыўся, і казалі: «Ці ж гэта Наомі?»
20 А яна казала ім: «Не называйце мяне Наомі, але называйце мяне Мара, бо вялікай горыччу
напоўніў мяне Усемагутны.
21 Я выйшла поўная, але пустою вярнуў мяне ГОСПАД. Чаму вы называеце мяне Наомі, калі
ГОСПАД выступіў супраць мяне і Усемагутны спаслаў няшчасьце на мяне».
22 І вярнулася Наомі, і Рут Мааўлянка, нявестка ейная, з ёю вярнулася з палёў Мааву, і прыйшлі
яны ў Бэтлеем на пачатку жніва ячменю.

Рут 2

1 У Наомі быў крэўны мужа ейнага, чалавек вельмі багаты, з калена Элімэлеха, і імя ягонае
Боаз.
2 І сказала Рут Мааўлянка Наомі: «Дазволь мне пайсьці на поле зьбіраць каласы за тым, у каго
ў вачах я знайду ласку». І яна сказала: «Ідзі, дачка мая».
3 І пайшла, і прыйшла, і зьбірала на полі за жняцамі. І здарылася, што яна патрапіла на частку
поля Боаза, які быў з калена Элімэлеха.

4 І вось, Боаз прыйшоў з Бэтлеему і сказаў жняцам: «ГОСПАД з вамі». І яны сказалі яму: «Няхай
дабраславіць цябе ГОСПАД».
5 І сказаў Боаз хлопцу свайму, пастаўленаму над жняцамі: «Чыя гэтая дзяўчына?»
6 І адказаў хлопец, пастаўлены над жняцамі, і сказаў: «Гэтая дзяўчына — Мааўлянка, якая
вярнулася з Наомі з краіны Мааў.
7 І яна сказала: “Дазволь мне зьбіраць і падбіраць між снапамі за жняцамі”. І яна прыйшла, і
застаецца ад раніцы аж да цяпер, а ў доме не адпачывала».
8 І сказаў Боаз Рут: «Паслухай мяне, дачка мая. Не хадзі зьбіраць на іншыя палі і не адыходзь
адсюль, і заставайся з дзяўчатамі маімі.
9 Падымі вочы твае на поле, на якім жнуць, і хадзі за імі, бо я загадаў хлопцам не чапаць цябе.
І калі будзеш смагнуць, падыходзь да глякоў і напіся з таго, адкуль чэрпаюць юнакі».
10 І яна ўпала на аблічча сваё, і пакланілася да зямлі, і сказала яму: «Чаму я знайшла ласку ў
вачах тваіх, і ты заўважыў мяне, хоць я — чужынка».
11 І адказаў Боаз, і сказаў ёй: «Расказваючы, расказалі мне пра ўсё, што ты зрабіла для
сьвякрухі тваёй пасьля сьмерці мужа твайго, і што ты пакінула бацьку твайго і маці тваю, і
зямлю юнацтва твайго, і прыйшла да народу, якога ня ведала ўчора і тры дні таму.
12 Няхай ГОСПАД аднагародзіць табе за ўчынак твой, і няхай будзе поўная твая ўзнагарода ад
ГОСПАДА, Бога Ізраіля, пад крылы Якога ты прыйшла схавацца».
13 А яна сказала: «Я знайшла ласку ў вачах тваіх, гаспадару мой, бо ты пацешыў мяне і гаварыў
да сэрца служкі тваёй, хоць я ня роўная ніводнай са служак тваіх».
14 І сказаў Боаз да яе: «У час пасілку прыходзь сюды і еш хлеб, і мачай кавалак свой у воцаце».
І яна села пры жняцах, і ён даў ёй пражаную пшаніцу, і яна ела, і насыцілася, і яшчэ засталося.
15 І яна ўстала зьбіраць, і Боаз загадаў хлопцам сваім: «Дайце ёй зьбіраць таксама між снапамі,
і не саромце яе.
16 І нават кідайце каласы для яе, і пакідайце для яе, і яна будзе зьбіраць, і ня ганьце яе».
17 І зьбірала яна на тым полі аж да вечару, і памалаціла тое, што сабрала, і было гэта каля эфы
ячменю.
18 І яна ўзяла гэта, і пайшла ў горад, і сьвякруха ейная ўбачыла тое, што яна назьбірала. І яна
дастала, і дала ёй тое, што засталося з пасілку.
19 І сказала ёй сьвякруха ейная: «Дзе ты зьбірала ў гэты дзень? І дзе ты працавала? Няхай
будзе дабраслаўлёны той, хто зьвярнуў на цябе ўвагу». І яна распавяла сьвякрусе сваёй, у
каго яна працавала, і сказала: «Імя чалавека, у якога я працавала сёньня, Боаз».
20 І сказала Наомі нявестцы сваёй: «Няхай ён будзе дабраслаўлёны ГОСПАДАМ, Які не забыўся
пра міласэрнасьць Сваю для жывых і памерлых». І сказала ёй Наомі: «Гэты чалавек — блізкі
сваяк наш, ён — сваяк-абаронца наш».
21 І сказала Рут Мааўлянка: «Ён сказаў яшчэ мне: “Заставайся з хлопцамі маімі, пакуль яны
ня скончаць усяго жніва”».
22 І сказала Наомі Рут, нявестцы сваёй: «Добра гэта, дачка мая, што ты будзеш хадзіць з
дзяўчатамі ягонымі і ня будуць табой пагарджаць на іншым полі».
23 І яна заставалася з дзяўчатамі Боаза, і зьбірала каласы, аж пакуль скончылася жніво ячменя
і пшаніцы, і яна жыла са сьвякрухай сваёй.

Рут 3

1 І сказала ёй Наомі, сьвякруха ейная: «Дачка мая, ці не пашукаць табе прыстанішча, каб добра
было табе?
2 І ці ж Боаз ня ёсьць нашым крэўным, з дзяўчынамі якога ты была? Вось, ён будзе веяць на
таку ячмень у гэтую ноч.
3 Памыйся, памажся, і апрані адзеньне тваё, і зыходзячы, зыйдзі на ток, але не паказвайся
гэтаму чалавеку, пакуль ён ня скончыць есьці і піць.
4 І калі ён ляжа спаць, заўваж месца, дзе ён ляжа, і падыйдзі, і адкрый ногі ягоныя, і ляж там,
і ён скажа табе, што табе рабіць».
5 І [Рут] сказала ёй: «Усё, што ты сказала мне, зраблю».

6 І зыйшла яна на ток, і зрабіла тое, што загадала ёй сьвякруха ейная.
7 І паеў Боаз, і выпіў, і стала добра сэрцу ягонаму, і пайшоў, каб легчы на канцы снапоў. І
прыйшла [Рут] паціху, і адкрыла ногі ягоныя, і легла.
8 І была палова ночы, і схамянуўся мужчына, і павярнуўся, і вось, жанчына ляжыць ля ног
ягоных.
9 І сказаў ён: «Хто ты?» І яна сказала: «Я — Рут, служка твая. Расьцягні плашч твой над
служкай тваёй, бо ты — сваяк-абаронца мой».
10 І сказаў ён: «Дабраслаўлёная ты ГОСПАДАМ, дачка мая. Ты зьявіла большую міласэрнасьць
цяпер, чым спачатку. Ты не пайшла шукаць маладых людзей, ці то багатых, ці то бедных.
11 І цяпер, дачка мая, ня бойся. Я зраблю для цябе ўсё, пра што ты сказала, бо ведаюць усе ў
брамах народу майго, што ты — жанчына дабрадзейная.
12 І гэта праўдзіва, што я — сваяк-абаронца твой, але ёсьць яшчэ сваяк-абаронца, бліжэйшы,
чым я.
13 Заставайся на ноч, а раніцаю, калі ён адкупіць цябе, добра, няхай адкупіць. А калі ён не
захоча адкупіць цябе, я адкуплю цябе, як жывы ГОСПАД. Сьпі тут да раніцы».
14 І спала яна ля ног ягоных аж да раніцы. І ўстала яна раней, чым чалавек можа пазнаць
бліжняга свайго. І сказаў [Боаз]: «Няхай ніхто ня ведае, што жанчына прыходзіла на ток».
15 І сказаў: «Дай накідку, якую маеш на сабе, і трымай яе». І яна трымала, а ён адмерыў ёй
шэсьць [мераў] ячменю, і ўсклаў на яе, і яна пайшла ў горад.
16 І прыйшла яна да сьвякрухі сваёй, і тая сказала ёй: «Што ў цябе, дачка мая?» І яна распавяла
ёй усё, што той чалавек зрабіў для яе.
17 І сказала: «Ён даў мне шэсьць [мераў] ячменю, бо сказаў ён мне: “Ня пойдзеш пустой да
сьвякрухі тваёй”».
18 І сказала [Наомі]: «Будзь спакойнай, дачка мая, аж пакуль даведаешся, як пойдуць справы,
бо гэты чалавек не супакоіцца, пакуль ня скончыць справы ў гэты дзень».

Рут 4

1 І ўзьняўся Боаз да брамы, і сеў там, і вось, сваяк-абаронца, пра якога казаў Боаз, ідзе. І кажа
[Боаз]: «Чалавеча, падыйдзі і сядзь тут». І той падыйшоў, і сеў.
2 І ўзяў [Боаз] дзесяць чалавек са старшыняў гораду, і сказаў: «Сядайце тут». І яны селі.
3 І сказаў [Боаз] да таго сваяка-абаронцы: «Частку поля, якая [належыць] брату нашаму
Элімэлеху, прадае Наомі, што вярнулася з палёў Мааву.
4 І я сказаў, што [належыцца] данесьці да вушэй тваіх гэтыя словы: “Набудзь [поле] перад
тымі, хто сядзіць тут, і перад старшынямі народу нашага”. Калі адкупіш, адкупляй. А калі не
адкупіш, скажы мне, каб я ведаў, бо ніхто ня можа адкупіць перад табою, а я — за табою». І
той сказаў: «Я адкуплю».
5 І сказаў Боаз: «У дзень, калі набудзеш поле з рук Наомі, а таксама Рут Мааўлянкі, жонкі
памерлага, набудзеш [абавязак] аднавіць імя памерлага ў спадчыне ягонай».
6 І сказаў той сваяк-абаронца: «Не магу адкупіць для сябе, бо я зруйную спадчыну сваю. Ты
адкупі для сябе маё права адкупленьня, бо я не магу адкупіць».
7 А было даўней у Ізраілі адносна адкупленьня і адносна зьмены ў зацьвярджэньні кожнай
справы, што чалавек здымаў сандал свой і даваў яго бліжняму свайму. І гэта было
сьведчаньнем у Ізраілі.
8 І сказаў той сваяк-абаронца Боазу: «Набудзь [гэта] сабе». І зьняў сандал свой.
9 І сказаў Боаз старшыням і ўсяму народу: «Вы — сьведкі ў гэты дзень, што я набыў з рукі Наомі
ўсё, што [належала] Элімэлеху, і ўсё, што [належала] Кільёну і Махлону.
10 І таксама Рут Мааўлянку, жонку Махлона, я набыў сабе за жонку, каб аднавіць імя памерлага
ў спадчыне ягонай, каб не загінула імя памерлага між братоў ягоных і ў брамах месца ягонага.
Вы — сьведкі ў гэты дзень».

11 І ўвесь народ, які быў у брамах, і старшыні сказалі: «Мы — сьведкі. Няхай зробіць ГОСПАД,
што жанчына, якая ўваходзіць у дом твой, будзе як Рахель і як Лея, якія збудавалі дом Ізраіля.
Здабудзь багацьце ў Эфраце, і няхай славіцца імя [тваё] ў Бэтлееме.
12 Няхай дом твой будзе як дом Пэрэса, якога Тамар нарадзіла Юдзе, праз насеньне, якое
ГОСПАД дасьць табе праз гэтую дзяўчыну».
13 І ўзяў Боаз Рут, і яна сталася жонкай ягонай. І ён увайшоў да яе, і ГОСПАД даў ёй зачаць, і
яна нарадзіла сына.
14 І сказалі жанчыны Наомі: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Які не пакінуў цябе без сваяка-
абаронцы ў гэты дзень, і няхай гучыць імя ягонае ў Ізраілі.
15 І будзе ён пацяшэньнем для душы і забесьпячэньнем старасьці тваёй. Бо нявестка твая, якая
любіць цябе, нарадзіла яго, тая, што лепшая для цябе за сем сыноў».
16 І ўзяла Наомі дзіцятка, і палажыла на ўлоньне сваё, і была для яго нянькаю.
17 І назвалі суседкі імя ягонае, кажучы: «Нарадзіўся сын у Наомі». І назвалі імя ягонае Абэд.
Ён — бацька Есэя, бацькі Давіда.
18 І вось радавод Пэрэса: Пэрэс нарадзіў Хецрона.
19 А Хецрон нарадзіў Рама, а Рам нарадзіў Амінадава.
20 А Амінадаў нарадзіў Нахшона, а Нахшон нарадзіў Сальму.
21 А Сальма нарадзіў Боаза, а Боаз нарадзіў Абэда.
22 А Абэд нарадзіў Есэя, а Есэй нарадзіў Давіда.

ПЕРШАЯ КНІГА САМУЭЛЯ

1 Быў адзін чалавек у Раматаіме, Цуфіт з гары Эфраіма, імем Элькана, сын Ерахама, сына Элігу,
сына Таку, сына Цуфа, Эфрацянін.
2 Ён меў дзьве жонкі: імя адной Ганна, а імя другой Пэніна. У Пэніны былі сыны, а ў Ганны
дзяцей не было.
3 Штогод той чалавек хадзіў з гораду свайго ў Шыло, каб пакланіцца і скласьці ахвяру ГОСПАДУ
Магуцьцяў. Былі там два сыны Гэлія: Хофні і Пінхас, сьвятары ГОСПАДА.
4 Калі Элькана складаў ахвяру, у той дзень даваў жонцы сваёй Пэніне і ўсім сынам і дочкам
ейным па частцы складанай ахвяры,
5 а Ганьне даваў падвойную частку, бо Ганну ён любіў. Але ГОСПАД не даваў ёй нарадзіць.
6 Суперніца ейная дакучала ёй, і дрэнчыла яе, бо ГОСПАД замкнуў улоньне ейнае.
7 Так цягнулася шмат гадоў; колькі разоў ішла яна ў сьвятыню ГОСПАДА, тая засмучала яе.
Ганна дзеля таго плакала і ня ела.
8 І сказаў ёй Элькана, муж ейны: «Чаму ты плачаш і чаму не ясі? Чаму сумуе сэрца тваё? Ці ж
я табе не мілейшы, чым дзесяць сыноў?»
9 Калі ў Шыло скончылі есьці і піць, Ганна ўстала. А сьвятар Гэлій сядзеў на крэсьле перад
брамай сьвятыні ГОСПАДА.
10 І Ганна, сумная душою, малілася да ГОСПАДА, горка плачучы.
11 І шлюбавала яна, кажучы: «ГОСПАД Магуцьцяў, калі Ты спагадна глянеш на прыніжэньне
служкі Тваёй, і прыгадаеш мяне, і не забудзешся пра служку Тваю, і дасі мне дзіця
мужчынскага роду, я аддам яго ГОСПАДУ на ўсе дні жыцьця ягонага, і лязо не кранецца галавы
ягонай».
12 Калі яна так шчыра і доўга малілася перад ГОСПАДАМ, Гэлій прыглядаўся да вуснаў ейных.
13 А Ганна гаварыла ў глыбіні сэрца свайго, і толькі варушыліся вусны ейныя, але голасу не
было чуваць, і Гэлій думаў, што яна п’яная,
14 і сказаў ёй: «Дакуль будзеш п’яная? Ацьверазіся ад віна».
15 Ганна адказала: «Не, гаспадару мой. Я — нешчасьлівая жанчына. Я ня піла нічога такога,
каб ап’янець, ані віна, ані сікеры, але я выліваю душу сваю перад ГОСПАДАМ.
16 Не лічы служкі тваёй за адну з дачок Бэліяла, бо я дзеля вялікага болю і смутку свайго
гаварыла ўвесь час».
17 І Гэлій засмуціўся, і сказаў ёй: «Ідзі ў супакоі, а Бог Ізраіля няхай споўніць просьбу тваю,
пра што маліла Яго».
18 А яна сказала: «О, няхай знойдзе служанка твая ласку ў вачах тваіх». І адыйшла тая жанчына
дарогаю сваёй, і ела, і аблічча ейнае не было ўжо такім, як раней.
19 І падняліся назаўтра рана, і пакланіліся перад ГОСПАДАМ, і пайшлі ў дарогу зваротную, і
прыйшлі ў дом свой у Раме. І Элькана спазнаў жонку сваю Ганну, і ГОСПАД узгадаў просьбу
ейную.
20 Ганна зачала па нейкім часе, і нарадзіла сына, і дала яму імя Самуэль, таму што ад ГОСПАДА
выпрасіла яго.
21 Муж ейны Элькана і ўвесь дом ягоны пайшоў злажыць штогадовую ахвяру ГОСПАДУ і
споўніць шлюбаваньні.
22 Але Ганна не пайшла. Яна сказала мужу свайму: «Не пайду, пакуль хлопчык ня будзе
адняты ад грудзей і падрасьце, а тады завяду яго, і ён стане перад абліччам ГОСПАДА, і
застанецца там назаўсёды».
23 Адказаў ёй Элькана, муж ейны: «Рабі, што добра ў вачах тваіх. Заставайся, пакуль яго не
адымеш ад грудзей. Толькі няхай ГОСПАД зьдзейсьніць словы Свае». І засталася маці дома, і
карміла сына свайго, пакуль не адняла яго ад грудзей сваіх.
24 Калі ўжо адняла, павяла яго з сабою, і ўзяла таксама трохгадовага бычка, адну эфу мукі і
буклак віна, і прывяла яго ў Дом ГОСПАДА ў Шыло. А хлопец быў яшчэ дзіцём.

25 І забілі бычка, і занесьлі хлопца да Гэлія.
26 І сказала [Ганна]: «Прашу, гаспадару мой, няхай жыве душа твая, гаспадару. Я — тая самая
жанчына, якая стаяла тут перад табой і маліла ГОСПАДА.
27 Маліла я пра гэтае дзіця, і споўніў ГОСПАД просьбу маю, што я прасіла ў Яго.
28 Таму я аддаю яго ГОСПАДУ на ўсе дні; колькі будзе жыць, ён аддадзены для ГОСПАДА». І
пакланіліся там ГОСПАДУ.

1 Сам 2

1 І Ганна малілася, і казала: “Радуецца сэрца маё ў ГОСПАДЗЕ, узьняўся рог мой у Богу маім.
Адкрыліся вусны мае супраць ворагаў маіх, бо радуюся я ў збаўленьні Тваім.
2 Ніхто не сьвяты так як ГОСПАД, бо няма нікога іншага, апроч Цябе. Ніхто не магутны, як Бог
наш.
3 Не памнажайце словаў фанабэрыстых. Няхай спыніцца пыхлівасьць вуснаў вашых, бо
ГОСПАД ёсьць Бог [усякіх] ведаў, Ён судзіць усе ўчынкі.
4 Лук волатаў ломіцца, а слабыя набіраюцца сілы.
5 Тыя, што былі насычаныя, наймаюцца за хлеб, а галодныя хлеба не патрабуюць, бясплодная
нараджае сем разоў, а тая, што мела шмат сыноў — саслабела.
6 ГОСПАД дае сьмерць і жыцьцё, кідае ў адхлань і выцягвае з яе.
7 ГОСПАД робіць бедным і багатым, паніжае і ўзвышае.
8 Ён выцягвае беднага з балота, і са сьмецьця падымае ўбогага, каб пасадзіць яго з князямі і
каб атрымаў ён у спадчыну пасад славы. Бо ГОСПАДА асновы зямлі, на іх Ён паставіў сусьвет.
9 Ён захоўвае крокі сьвятых Сваіх, а бязбожнікі ў цемры зьнікаюць, бо ня сілаю сваёю перамагае
чалавек.
10 ГОСПАД зьнішчае супраціўнікаў Сваіх, грыміць на іх у нябёсах. ГОСПАД будзе судзіць канцы
зямлі, і дасьць уладу валадару Свайму, і ўзвысіць рог памазанца Свайго».
11 І вярнуўся Элькана ў Раму, у дом свой. А хлопчык застаўся служыць ГОСПАДУ пад наглядам
Гэлія сьвятара.
12 А сыны Гэлія [былі] як сыны Бэліяла, і ня ведалі яны ані ГОСПАДА,
13 ані абавязак сьвятарскі адносна народу, але калі нехта складаў ахвяру крывавую, прыходзіў
слуга сьвятара з трызубым відэльцам у руцэ і, калі варылася мяса,
14 запускаў яго ў кацёл, або ў гаршчок, або ў патэльню, або ў міску, і ўсё, што выдабыў
відэльцам, забіраў сабе сьвятар. Так рабілі з усімі Ізраільцянамі, якія прыходзілі ў Шыло.
15 І нават яшчэ ня быў спалены тлушч, а ўжо прыходзіў слуга сьвятара і казаў таму, хто складаў
ахвяру: «Дай мне мяса, а я сьпяку яго сьвятару, бо ён ня прыйме ад цябе варанага мяса, але
толькі сырое».
16 І казаў яму той, што складаў ахвяру: «Дазволь спаліць тлушч, а тады возьмеш сабе, што душа
твая зажадае». [Слуга] адказваў яму: «Ніякім чынам. Давай цяпер; а калі не, забяру сілай».
17 І грэх тых юнакоў быў вельмі вялікі перад абліччам ГОСПАДА, бо яны зьневажалі ахвяры
ГОСПАДУ.
18 А Самуэль служыў перад абліччам ГОСПАДА як хлопец, апрануты ў ільняны эфод.
19 Маці ягоная шыла яму малую шату, якую прыносіла яму штогод, калі прыходзіла з мужам
скласьці ахвяру штогадовую.
20 І дабраславіў Гэлій Элькану і жонку ягоную, кажучы: «Няхай дасьць табе ГОСПАД нашчадкаў
з гэтай жонкі ў замену за ўпрошанага, якога ты аддаў ГОСПАДУ». І яны варочаліся ў дом свой.
21 І паспагадаў ГОСПАД Ганьне, і яна зачала, і нарадзіла трох сыноў і дзьве дачкі. А юнак
Самуэль рос пры ГОСПАДЗЕ.
22 Гэлій быў ужо вельмі стары. І чуў ён усё, што рабілі сыны ягоныя адносна ўсіх Ізраільцянаў,
як яны спалі з жанчынамі, якія зьбіраліся пры ўваходзе ў Намёт Спатканьня.
23 І сказаў ён ім: «Чаму дапускаецеся вы такіх учынкаў, бо я чую пра ліхія справы вашыя ад
усяго народу?
24 Спыніцеся, сыны мае. Нядобрая гэта слава, пра якую я чую. Вы разбэшчваеце народ
ГОСПАДА.

25 Калі саграшыць чалавек супраць чалавека, судзьдзёю яму можа быць Бог. Але калі супраць ГОСПАДА саграшыць чалавек, хто заступіцца за яго?» Але яны ня слухалі перасьцярогі бацькі свайго, бо ГОСПАД вырашыў аддаць іх на сьмерць.
26 А юнак Самуэль рос, і падабаўся як ГОСПАДУ, так і людзям.
27 І прыйшоў да Гэлія чалавек Божы, і сказаў яму: «Гэта кажа ГОСПАД: “Ці ж Я не зьявіўся дому бацькі твайго, калі былі яны ў Эгіпце ў доме фараона?
28 Спаміж усіх пакаленьняў Ізраіля Я выбраў іх Сабе на сьвятароў, каб прыходзілі да ахвярніка Майго складаць ахвяры каджэньня і насіць перад абліччам Маім эфод. Я даў для дому бацькі твайго ўсе ахвяры сыноў Ізраіля.
29 Чаму вы топчаце нагамі ахвяры Мае крывавыя і ахвяры хлебныя, якія Я ўстанавіў, каб яны былі складаныя ў сьвятыні. Ты больш шануеш сыноў сваіх, чым Мяне, каб яны сыцелі на найлепшых частках з усіх дароў Ізраіля, народу Майго”.
30 Дзеля гэтага кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я з моцай казаў дому бацькі твайго, што будуць яны служыць перад абліччам Маім на вякі. Але цяпер, кажа ГОСПАД, гэтак ня будзе ў Мяне. Цяпер так будзе: хто будзе славіць Мяне, і Я таго праслаўлю; а хто зьневажае Мяне, той будзе ў ганьбе.
31 Вось, прыходзяць дні, у якія Я адсяку рамяно тваё і рамяно дому бацькі твайго, каб не было старога ў доме тваім.
32 Ты будзеш бачыць бедства сьвятыні Маёй, [нават] калі ГОСПАД будзе рабіць добрае Ізраілю, і ў доме тваім ня будзе старога ў-ва ўсе часы.
33 Аднак Я не забяру цалкам чалавека з цябе ад ахвярніка Майго, каб выцяклі вочы твае і ссохла душа твая, але загіне большая частка дому твайго.
34 І вось, будзе табе знак, які станецца з абодвума сынамі тваімі, з Хофні і Пінхасам, абодва ў адзін дзень памруць.
35 А Я пастаўлю Сабе сьвятара вернага, які паводле сэрца Майго і паводле душы Маёй будзе рабіць. І пастаўлю яму дом цьвёрды, і ён будзе хадзіць перад памазанцам Маім усе дні.
36 І будзе, што той, хто яшчэ застанецца ў доме тваім, прыйдзе і ўпакорыцца перад ім дзеля срэбнай манэты або дзеля кавалка хлеба, і будзе казаць: "Дай мне хоць які абавязак сьвятарскі, каб я мог зьесьці лусту хлеба"”».

1 Сам 3

1 Юнак Самуэль служыў ГОСПАДУ пад наглядам Гэлія. І слова ГОСПАДА было рэдкім у тыя дні, і відзежаў не было.
2 І сталася, што аднаго дня Гэлій спаў на месцы сваім, а вочы ягоныя саслабелі, і ён ня мог бачыць.
3 І лямпа Божая не была яшчэ патушаная, і Самуэль спаў у сьвятыні ГОСПАДА, дзе быў Каўчэг Божы.
4 І паклікаў ГОСПАД Самуэля. Ён адказаў: «Вось я».
5 І пабег да Гэлія, і сказаў: «Вось я, бо ты клікаў мяне». Ён сказаў: «Я ня клікаў цябе. Вяртайся і сьпі». І ён пайшоў, і лёг спаць.
6 І ГОСПАД зноў паклікаў Самуэля, і сказаў: «Самуэль, Самуэль». Той пабег да Гэлія і сказаў: «Вось я, бо ты клікаў мяне». Ён сказаў: «Я ня клікаў цябе, сын мой. Вяртайся і сьпі».
7 Бо Самуэль не пазнаў яшчэ ГОСПАДА і не было яшчэ яму аб’яўлена слова ГОСПАДА.
8 Але ГОСПАД зноў паклікаў Самуэля трэці раз. Ён падняўся і пабег да Гэлія, і сказаў: «Вось я, бо ты клікаў мяне». І зразумеў Гэлій, што ГОСПАД кліча юнака.
9 І ён сказаў Самуэлю: «Ідзі і кладзіся спаць, а калі зноў пакліча цябе, скажы: “Гавары, ГОСПАДЗЕ, бо слухае слуга Твой”». І вярнуўся Самуэль, і лёг спаць на месцы сваім.
10 І прыйшоў ГОСПАД, і стаў, і паклікаў як раней: «Самуэль, Самуэль!» І Самуэль сказаў: «Гавары, ГОСПАДЗЕ, бо слухае слуга Твой».
11 І сказаў ГОСПАД Самуэлю: «Вось, Я зраблю ў Ізраілі такое, што ўсім, хто пра гэта пачуе, зазьвініць у абодвух вушах.

12 У дзень той Я споўню над Гэліем усё, што прадказаў адносна дому ягонага, ад пачатку і да
канца.
13 Я прадказаў яму, што буду судзіць дом ягоны на вякі дзеля грэху, бо ён ведаў, што сыны
ягоныя зьневажаюць Бога, і не караў іх.
14 Дзеля гэтага Я прысягнуў дому Гэлія, што ня будзе ачышчана правіна дому ягонага ані
ахвярамі крывавымі, ані ахвярамі хлебнымі, на вякі».
15 І ляжаў Самуэль аж да раніцы, а потым адчыніў браму Дому ГОСПАДА. І баяўся Самуэль
сказаць Гэлію пра гэты відзеж.
16 Але Гэлій паклікаў Самуэля і сказаў: «Самуэль, сын мой». Ён адказаў: «Вось я».
17 І спытаўся [Гэлій] у яго: «Што за слова, якое было сказана табе? Прашу, ня ўтойвай ад
мяне. Няхай гэта зробіць табе Бог і тое дадасьць, калі будзеш хаваць ад мяне нешта з таго,
што сказана было табе».
18 І выявіў яму Самуэль усё сказанае, і ня ўтойваў ад яго. І Гэлій сказаў: «Ён — ГОСПАД! Няхай
робіць, што добрае ў вачах Ягоных».
19 І рос Самуэль, і ГОСПАД быў з ім. І з усіх словаў ягоных ніводнае ня ўпала на зямлю.
20 І даведаўся ўвесь Ізраіль ад Дану аж да Бээр-Шэвы, што Самуэль стаў прарокам ГОСПАДА.
21 І працягваў ГОСПАД зьяўляцца ў Шыло пасьля таго, як зьявіў Сябе Самуэлю ў Шыло ў слове
ГОСПАДА.

1 Сам 4

1 І было слова Самуэля да ўсяго Ізраіля. Ізраільцяне вырушылі на вайну супраць Філістынцаў
і разлажыліся табарам каля Эбэн-Гаэзэру, а Філістынцы разлажылі табар свой у Афэку.
2 І выставілі Філістынцы шыхты супраць Ізраіля, і пачаўся бой. Ізраільцяне сталі адступаць
перад Філістынцамі, і загінула ў тым баі на полі каля чатырох тысячаў ваяроў.
3 І вярнуўся народ у табар, і старшыні Ізраіля сказалі: «Чаму ўдарыў сёньня нас ГОСПАД у баі
з Філістынцамі? Давайце прынясем з Шыло Каўчэг Запавету ГОСПАДА, і няхай ён будзе сярод
нас, каб ратаваць нас ад рук ворагаў нашых».
4 І паслалі народ у Шыло, каб прынесьлі адтуль Каўчэг Запавету ГОСПАДА Магуцьцяў, Які
сядзіць на херувімах. Пры Каўчэгу Запавету Божага былі два сыны Гэлія, Хофні і Пінхас.
5 Калі прынесьлі Каўчэг Запавету ГОСПАДА ў табар, загаманіў увесь Ізраіль голасам вялікім,
аж задрыжэла зямля.
6 Гэты крык пачулі Філістынцы і пыталіся: «Што гэта за крык вялікі ў табары Гебраяў?» І
даведаліся, што Каўчэг ГОСПАДА прыйшоў у табар.
7 І спалохаліся Філістынцы, і казалі: «Прыйшоў Бог у табар!» І сказалі яны: «Гора нам! Бо не
было такога ані ўчора, ані пазаўчора.
8 Гора нам! Хто нас захавае ад рукі гэтага Бога магутнага? Гэта той самы Бог, які ўдарыў Эгіпет
усякімі карамі ў пустыні.
9 Умацуйцеся і будзьце мужнымі, Філістынцы, каб не служылі вы Гебраям, як яны служылі
вам. Будзьце мужнымі і ваюйце!»
10 І ваявалі Філістынцы, і перамаглі Ізраіля, так што кожны ўцёк у намёт свой. І параза гэтая
была страшная, бо ў Ізраіля палегла трыццаць тысячаў пяхотнікаў.
11 І Каўчэг Божы быў узяты, і два сыны Гэлія, Хофні і Пінхас, былі забітыя.
12 Адзін Бэн'ямінец уцёк з бою і прыйшоў у Шыло ў падзёртым адзеньні і з абсыпанай пылам
галавою.
13 Калі ён прыбег, Гэлій сядзеў на крэсьле каля брамы, гледзячы на дарогу, бо ён трывожыўся
дзеля Каўчэга Божага. А чалавек той прыйшоў і паведаміў гораду, і ўвесь горад загаласіў.
14 І пачуў Гэлій голас крыку, і спытаўся: «Што азначае гармідар гэты?» А той чалавек
пасьпяшаўся, і прыйшоў, і паведаміў Гэлію.
15 Гэлій меў дзевяноста восем гадоў, і вочы ягоныя саслабелі, і ён ня мог бачыць.
16 Уцякач сказаў Гэлію: «Я прыйшоў з месца бою, я — той, хто вырваўся сёньня з шыхтоў».
Гэлій спытаўся: «Што сталася, сын мой?»

17 І адказаў вясьнік: «Ізраільцяне ўцяклі перад Філістынцамі, народ атрымаў страшную паразу, і абодва сыны твае, Хофні і Пінхас, загінулі, і Каўчэг Божы ўзяты».
18 Калі той сказаў пра Каўчэг Божы, Гэлій зваліўся з крэсла на кант брамы, і зламаў сабе карак, і памёр, бо ён быў стары і цяжкі. Ён судзіў Ізраіль сорак гадоў.
19 А нявестка ягоная, жонка Пінхаса, якая была цяжарная і мела хутка нарадзіць, калі даведалася, што Каўчэг Божы ўзяты і што сьвёкар ейны і муж загінулі, упала і нарадзіла, бо прыйшлі на яе болі радзінаў.
20 І калі канала, казалі ёй жанчыны, якія стаялі кругом яе: «Ня бойся! Ты нарадзіла сына». Але яна не адказала ім і не зьвярнула на іх увагі.
21 І назвала хлопчыка Іхавод, кажучы: «Адыйшла слава ад Ізраіля» з прычыны ўзяцьця Каўчэга Божага, а таксама сьмерці сьвёкра і мужа.
22 І паўтарыла: «Адыйшла слава ад Ізраіля, бо ўзяты Каўчэг Божы».

1 Сам 5

1 А Філістынцы ўзялі Каўчэг Божы і занесьлі яго з Эбэн-Гаэзэру ў Ашдод.
2 І ўзялі Філістынцы Каўчэг Божы, і занесьлі яго ў сьвятыню Дагона, і паставілі яго каля Дагона.
3 Калі на другі дзень Ашдодцы ўсталі рана, вось, Дагон ляжаў абліччам на зямлі перад Каўчэгам Божым. І паднялі яны Дагона, і паставілі на месца ягонае.
4 На другі дзень, рана ўстаўшы, знайшлі, што Дагон зноў ляжыць абліччам сваім на зямлі перад Каўчэгам ГОСПАДА, а галава Дагона і дзьве далоні рук ягоных адсечаныя ляжаць на парозе, і толькі тулава Дагона засталося пры ім.
5 Таму сьвятары Дагона і ўсе, хто ўваходзіць у дом Дагона, не ступаюць на парог Дагона ў Ашдодзе па сёньняшні дзень.
6 І рука ГОСПАДА зацяжэла над жыхарамі Ашдоду, і напалохала іх, і пакараў Ён балячкамі як Ашдод, так і ваколіцы ягоныя.
7 І людзі Ашдоду ўбачылі гэта, і сказалі: «Няхай не застаецца Каўчэг Божы ў нас, бо зацяжэла рука Ягоная на нас і на Дагоне, богу нашым».
8 І паслалі, і сабралі яны ўсіх валадароў Філістынскіх, і сказалі: «Што маем зрабіць з Каўчэгам Бога Ізраіля?” Яны сказалі: “Трэба Каўчэг Божы перанесьці ў Гат». І перанесьлі [туды] Каўчэг Бога Ізраіля.
9 І калі перанесьлі яго, зацяжэла рука ГОСПАДА над горадам, і страх вельмі вялікі, і ўдарыў [Бог] жыхароў гораду ад малога да вялікага, і зьявіліся на іх болькі.
10 І адаслалі яны Каўчэг Божы ў Экрон. Калі прыйшоў Каўчэг Божы ў Экрон, паднялі крык Экронцы, кажучы: «Вы прынесьлі да нас Каўчэг Бога Ізраіля, каб выгубіць нас і народ наш!»
11 І паслалі, і сабралі яны ўсіх валадароў Філістынскіх, і сказалі: «Адашліце Каўчэг Бога Ізраіля, няхай вяртаецца ён на месца сваё і няхай не забівае нас і народ наш». Бо апанаваў страх сьмерці ўвесь горад і вельмі цяжкая [стала] рука Божая.
12 Людзі, якія не паўміралі, былі пакрытыя болькамі, і лямант у горадзе падымаўся ў неба.

1 Сам 6

1 І быў Каўчэг ГОСПАДА ў зямлі Філістынскай сем месяцаў.
2 І паклікалі Філістынцы сьвятароў і варажбітоў, і спыталіся: «Што маем зрабіць з Каўчэгам ГОСПАДА? Парайце нам, як маем адаслаць яго на месца ягонае».
3 Яны сказалі: «Калі будзеце адсылаць Каўчэг Бога Ізраіля, не адсылайце яго пустым, але тое, што належыцца, аддайце за грэх, і тады паздаравееце. І даведаецеся, чаму не адступае рука Ягоная ад вас».
4 Яны спыталіся: «Чым і як маем Яму за грэх аднагародзіцца?» Яны адказалі: «Паводле ліку валадароў Філістынскіх зрабіце пяць болек залатых і пяць мышэй залатых, бо пляга тая самая дакранулася ўсіх вас і валадароў вашых.
5 Зрабіце выявы болек і выявы мышэй, якія нішчаць зямлю, і аддайце славу Богу Ізраіля, каб Ён адхіліў руку Сваю ад вас, ад багоў вашых і ад зямлі вашай.

6 Чаму вы робіце цьвёрдымі сэрцы вашыя, як Эгіпет і фараон зрабілі цьвёрдым сэрца сваё, бо
яны не дазволілі ім адыйсьці, калі [Бог] караў іх.
7 І цяпер падрыхтуйце новы воз і дзьве дойныя каровы, на якіх не было ярма, і запражыце
кароваў у вазы, а цялятаў іхніх адвядзіце дамоў.
8 І вазьміце Каўчэг ГОСПАДА, і пастаўце яго на воз, а выявы залатыя, якія маеце аддаць Яму за
грэх, палажыце ў скрынку збоку яго. І так пусьціце яго ў дарогу.
9 І глядзіце, калі ён накіруецца дарогай да межаў сваіх да Бэт-Шэмэшу, ведайце, што гэта [Бог]
навёў на вас гэтае вялікае няшчасьце; а калі не, будзем ведаць, што не рука Ягоная да нас
дакранулася, але гэта было выпадкова».
10 І зрабілі людзі такім чынам. І ўзялі дзьве дойныя каровы, і запрэглі іх у воз, а цялятаў іхніх
затрымалі ў хляве.
11 І паставілі Каўчэг ГОСПАДА на воз, і скрынку з залатымі мышамі і выявамі болек.
12 І каровы пайшлі простаю дарогаю ў накірунку Бэт-Шэмэшу, і ідучы па гэтым шляху, не
зыходзілі ані ўправа, ані ўлева. А валадары Філістынскія ішлі за імі аж да межаў Бэт-Шэмэшу.
13 А ў Бэт-Шэмэшы на раўніне жалі пшаніцу. І падняўшы вочы, убачылі [жняцы] Каўчэг, і
ўсьцешыліся, убачыўшы яго.
14 А воз узьехаў на поле Егошуа з Бэт-Шэмэшу і затрымаўся там. І ляжаў там камень вялікі. І
яны пасеклі воз на дровы, а кароваў склалі ў ахвяру цэласпаленьня для ГОСПАДА.
15 І лявіты зьнялі Каўчэг Божы і скрынку, якая ляжала побач яго, у якой знаходзіліся выявы
залатыя, і палажылі іх на вялікім камяні. І склалі ў той дзень людзі Бэт-Шэмэшу ГОСПАДУ
ахвяры цэласпаленьня і ахвяры крывавыя.
16 І пяць валадароў Філістынскіх бачылі гэта, і вярнуліся ў Экрон у той самы дзень.
17 Вось болькі залатыя, складзеныя Філістынцамі ГОСПАДУ за грэх: адзін — за Ашдод, адзін —
за Газу, адзін — за Ашкелён, адзін — за Гат і адзін — за Экрон.
18 А залатыя мышы былі паводле лічбы гарадоў Філістынскіх пяці валадароў іхніх, ад
умацаванага гораду да пасяленьня, якое без муроў. Камень жа той вялікі, на якім паставілі
Каўчэг ГОСПАДА на полі Егошуа з Бэт-Шэмэшу, ёсьць сьведкам гэтаму аж па сёньняшні дзень.
19 І ўдарыў ГОСПАД людзей Бэт-Шэмэшу, якія заглядалі ў Каўчэг ГОСПАДА, і выбіў з народу з
пяцідзесяці тысячаў семдзясят чалавек. І народ быў у жалобе, бо ГОСПАД ударыў народ так
страшнай карай.
20 І сказалі людзі Бэт-Шэмэшу: «Хто можа стаць перад ГОСПАДАМ, гэтым Сьвятым Богам? Да
каго Ён пяройдзе ад нас?»
21 І паслалі яны пасланцоў да жыхароў Кірыят-Ярыму, кажучы: «Вярнулі Філістынцы Каўчэг
ГОСПАДА. Прыходзьце і забярыце яго да сябе».

1 Сам 7

1 І прыйшлі жыхары Кірыят-Ярыму, і забралі Каўчэг ГОСПАДА, і прынесьлі яго на ўзгорак у
дом Абінадава, і пасьвяцілі Элеазара, сына ягонага, каб захоўваў Каўчэг ГОСПАДА.
2 З таго дня, як застаўся Каўчэг ГОСПАДА ў Кірыят-Ярыме, прайшло шмат дзён, дваццаць гадоў.
І ўвесь дом Ізраіля галасіў дзеля ГОСПАДА.
3 І сказаў Самуэль усяму дому Ізраіля: «Калі хочаце навярнуцца ўсім сэрцам да ГОСПАДА,
выкіньце спасярод сябе ўсіх багоў чужых і Астарту, і прыхіліце сэрцы свае да ГОСПАДА, і
служыце Яму аднаму, і Ён выратуе вас з рук Філістынцаў».
4 І павыкідалі сыны Ізраіля Баалаў і Астарту, і служылі толькі ГОСПАДУ.
5 І сказаў Самуэль: «Зьбярыце ўвесь Ізраіль у Міцпе, і я памалюся за вас да ГОСПАДА».
6 І сабраліся ў Міцпе, і чэрпалі ваду, і вылівалі перад абліччам ГОСПАДА, і посьцілі ў той дзень,
і казалі там: «Саграшылі мы перад ГОСПАДАМ». І судзіў Самуэль сыноў Ізраіля ў Міцпе.
7 І пачулі Філістынцы пра тое, што сыны Ізраіля сабраліся ў Міцпе, і валадары Філістынцаў
пайшлі супраць Ізраільцянаў. І калі даведаліся пра гэта сыны Ізраіля, яны напалохаліся
Філістынцаў,

8 і прасілі сыны Ізраіля Самуэля: «Не пераставай за нас клікаць да ГОСПАДА, Бога нашага, каб
Ён выратаваў нас з рук Філістынцаў».
9 І ўзяў Самуэль адно ягнятка-сасунка, і склаў усяго яго ГОСПАДУ ў ахвяру цэласпаленьня. І
клікаў Самуэль ГОСПАДА ў справе Ізраіля, і выслухаў яго ГОСПАД.
10 І калі Самуэль складаў ахвяру цэласпаленьня, Філістынцы пайшлі ў бой супраць Ізраіля. У
той дзень загрымеў ГОСПАД грымотамі вялікімі над Філістынцамі і напалохаў іх, і былі яны
пабітыя Ізраільцянамі.
11 І выйшлі Ізраільцяне з Міцпы, і перасьледавалі Філістынцаў, і забівалі іх аж да Бэт-Кару.
12 І ўзяў Самуэль адзін камень, і палажыў яго паміж Міцпою і Шэнам, і назваў тое месца Эбэн-
Гаэзэр, і сказаў: «Аж дасюль дапамог нам ГОСПАД».
13 Так упакораны былі Філістынцы, і больш не хадзілі яны ў межы Ізраіля. І была рука ГОСПАДА
на Філістынцах у-ва ўсе дні Самуэля.
14 І вярнуліся да Ізраіля гарады, забраныя Філістынцамі ад Экрону аж да Гату. Ізраільцяне
забралі землі свае з рук Філістынцаў, і запанаваў мір між Ізраілем і Амарэйцамі.
15 І судзіў Самуэль Ізраіля ў-ва ўсе дні жыцьця свайго.
16 І штогод ён хадзіў у Бэтэль, Гільгал і Міцпу, і судзіў Ізраіля ў-ва ўсіх гэтых месцах.
17 Пасьля вяртаўся ў Раму, бо там быў дом ягоны, і там судзіў Ізраіля. І ён пабудаваў там
ахвярнік ГОСПАДУ.

1 Сам 8

1 Калі Самуэль пастарэў, ён паставіў судзьдзямі Ізраіля сыноў сваіх.
2 Першародны сын ягоны называўся Ёэль, а імя другога было Абія. Судзілі яны Ізраіля ў Бээр-
Шэве.
3 І не хадзілі сыны ягоныя шляхамі ягонымі, але паддаліся хцівасьці, і бралі хабары, і
фальшавалі суд.
4 І сабраліся ўсе старшыні Ізраіля, і пайшлі да Самуэля ў Раму.
5 І сказалі яму: «Вось, ты пастарэў, а сыны твае ня ходзяць шляхамі тваімі. Дык пастаў нам
цяпер валадара, каб ён судзіў нас, як [маюць гэта] ўсе народы».
6 І ліхім было слова гэтае ў вачах Самуэля, што яны казалі: «Дай нам валадара, каб ён судзіў
нас». І маліўся Самуэль да ГОСПАДА.
7 І сказаў ГОСПАД Самуэлю: «Паслухай голас народу ў-ва ўсім, што яны просяць цябе, бо не ад
цябе адварочваюцца яны, але ад Мяне, каб Я не валадарыў над імі.
8 Як хадзілі яны з таго дня, калі Я вывеў іх з Эгіпту, і аж да сёньняшняга дня, пакідаючы Мяне
і служачы багам чужым, таксама робяць і табе.
9 Дык цяпер выслухай просьбу іхнюю, толькі папярэдзь іх і патлумач ім пастановы адносна
валадара, які мае над імі валадарыць».
10 І Самуэль пераказаў народу ўсе словы ГОСПАДА, бо народ прасіў у яго валадара.
11 Ён сказаў: «Такія пастановы адносна валадара, які будзе валадарыць над вамі. Ён возьме
сыноў вашых і пасадзіць іх у калясьніцы свае і на коней сваіх, і яны будуць імчаць перад
калясьніцай ягонай.
12 І паставіць іх тысячнікамі, і пяцідзясятнікамі, і аратымі ральлі ягонай, і жняцамі ніваў
ягоных, кавалямі зброі ягонай і калясьніцаў ягоных.
13 Дочак вашых ён зробіць варыцелькамі пахошчаў, кухаркамі і пекаркамі.
14 І забярэ ён у вас найлепшыя землі вашыя, вінаграднікі і сады аліўкавыя, і падорыць іх слугам
сваім.
15 Нівы вашыя і вінаграднікі абцяжарыць дзесяцінай, і аддасьць яе эўнухам сваім і слугам
сваім.
16 Возьме таксама слугаў вашых і служак вашых, найлепшых валоў вашых і аслоў вашых, і
выкарыстае іх дзеля працы сваёй.
17 І абложыць ён дзесяцінай авечак вашых, і будзеце вы ў яго слугамі.
18 І будзеце наракаць у той дзень на валадара вашага, якога выбралі сабе, але ГОСПАД ня
выслухае вас у той дзень».

19 І не хацеў народ слухаць голас Самуэля, і казалі яны: «Ніякім чынам! Няхай валадар будзе над намі,
20 і будзем мы жыць, як жывуць усе народы. Валадар наш будзе судзіць нас, і будзе ачольваць нас, і будзе выходзіць перад абліччам нашым на бой у войнах нашых».
21 І выслухаў Самуэль усе словы народу, і пераказаў іх у вушы ГОСПАДУ.
22 І сказаў ГОСПАД Самуэлю: «Выслухай просьбу іхнюю і пастаў над імі валадара». І сказаў Самуэль людзям Ізраіля: «Варочайцеся кожны ў горад свой».

1 Сам 9

1 І быў адзін ваяр мужны з [роду] Бэн'яміна, на імя Кіш, сын Абіэля, сына Цэрора, сына Бэхарата, сына Афіяха, сына Бэн'яміна.
2 І быў у яго сын, імя якога Саўл, малады і прыгожы, і не было спаміж сыноў Ізраіля лепшага за яго. Ён быў на галаву вышэй ад усяго народу.
3 І прапалі ў Кіша, бацькі Саўла, асьліцы. І сказаў Кіш Саўлу, сыну свайму: «Вазьмі з сабой аднаго са слугаў, устань і ідзі, пашукай асьліцаў».
4 І прайшоў ён гару Эфраіма і зямлю Шаліша, і не знайшоў. І прайшлі яны зямлю Шаалім, і не было іх, пасьля зямлю Бэн'яміна, і не знайшлі.
5 І прыйшлі яны ў зямлю Цуф, і сказаў Саўл слузе свайму, які [быў] з ім: «Хадзем, вернемся, каб бацька мой, забыўшыся пра асьліцаў, ня стаў хвалявацца пра нас».
6 [Слуга] сказаў яму: «Вось, у гэтым горадзе жыве чалавек Божы, чалавек шанаваны. Усё, што ён кажа, спаўняецца. Дык давай зойдзем туды, можа, ён распавядзе нам пра шлях, па якім нам трэба ісьці».
7 І сказаў Саўл слузе свайму: «Так, зойдзем. Але што падаруем мы чалавеку гэтаму? Хлеб скончыўся ў торбах нашых, а падарунка ня маем, які маглі б прынесьці чалавеку Божаму. Што мы маем?»
8 А слуга зноў сказаў Саўлу: «Вось, я знайшоў у руцэ маёй чвэрць сыкля срэбра, дык дамо гэта чалавеку Божаму, а ён распавядзе нам пра шлях наш».
9 Раней у Ізраілі кожны, хто ішоў параіцца ў Бога, так казаў: «Хадземце да відушчага»; бо хто сёньня называецца прарокам, раней называўся відушчым.
10 І сказаў Саўл слузе свайму: «Добра ты сказаў, давай пойдзем». І пайшлі яны ў горад, у якім жыў чалавек Божы.
11 Калі яны падыйшлі да гораду, напаткалі дзяўчат, якія выходзілі чэрпаць ваду, і спыталіся ў іх: «Ці тут жыве відушчы?»
12 Яны адказалі ім, кажучы: «Тут, вось, перад табой. Пасьпяшайся цяпер, бо сёньня ён прыйшоў у горад, бо сёньня народ складае ахвяру на ўзгорку.
13 Калі ўвойдзеце ў горад, сустрэнеце яго там, перш чым пойдзе частавацца на ўзгорак, бо народ ня есьць, пакуль ён ня прыйдзе. Бо ён дабраслаўляе ахвяру, і тады толькі ядуць запрошаныя. Дык ідзіце, зараз яго сустрэнеце».
14 І падняліся яны ў горад. Калі яны ўвайшлі ў горад, вось, Самуэль ідзе насустрач ім, каб падняцца на ўзгорак.
15 А ГОСПАД аб'явіў Самуэлю на дзень раней, перад прыйсьцем Саўла, кажучы:
16 «Заўтра ў гэтую самую пару пашлю да цябе чалавека з зямлі Бэн'яміна. Ты памажаш яго на валадара народу Майго Ізраіля. Ён вызваліць народ Мой з рук Філістынцаў, бо Я ўзглянуў на народ Мой, бо лямант ягоны дайшоў да Мяне».
17 Калі Самуэль глянуў на Саўла, ГОСПАД сказаў яму: «Гэта той чалавек, пра якога Я казаў табе. Ён будзе валадаром над народам Маім».
18 І Саўл падыйшоў да Самуэля ў браме, і сказаў: «Пакажы мне, калі ласка, дзе дом відушчага?»
19 Самуэль адказаў Саўлу, кажучы: «Я — відушчы. Узыйдзі да мяне на ўзгорак, і падсілкуемся сёньня разам. Я адпушчу цябе раніцаю і скажу табе ўсё, што трывожыць сэрца тваё.
20 А што датычыць асьліцаў, якія прапалі тры дні таму, не клапаціся, бо яны ўжо знайшліся. Бо каму будзе належаць усё, што найлепшае ў Ізраілі? Ці ж не табе і ўсяму дому бацькі твайго?»

21 Адказаў Саўл яму і сказаў: «Ці ж я не Бэн’ямінец, з найменшага калена Ізраіля? І сям'я мая
ці не найменшая з усіх сем'яў калена Бэн’яміна? Чаму тады ты гаворыш мне словы гэтыя?»
22 І ўзяў Самуэль Саўла і слугу ягонага, і ўвёў іх у пакой, і даў ім першае месца між
запрошанымі, якіх было каля трыццаці чалавек.
23 І сказаў Самуэль кухару: «Дай тую частку, якую я даў табе і пра якую казаў табе: “Адкладзі
яе ў сябе”».
24 І кухар узяў сьцягно і тое, што было пры ім, і палажыў перад Саўлам. І сказаў [Самуэль]:
«Вось тое, што пакінутае. Палажы перад сабой і еш, бо гэта раней захавана для цябе, калі я
вырашыў склікаць людзей». У той дзень елі разам Саўл з Самуэлем.
25 І зыйшлі яны з узгорку ў горад. І ён размаўляў з Саўлам на даху.
26 Калі раніцай яны ўсталі і ўжо разьвіднела, паклікаў Самуэль Саўла на дах і сказаў: «Уставай,
я цябе правяду». І ўстаў Саўл, і выйшлі яны абодва, ён і Самуэль.
27 І калі падыходзілі яны да канца гораду, Самуэль сказаў Саўлу: «Скажы слузе, каб пайшоў
перад намі». І калі ён пайшоў, сказаў: «Ты цяпер спыніся, і я абвяшчу табе слова Бога».

1 Сам 10

1 І ўзяў Самуэль пасудзіну з алеем, і выліў на галаву ягоную, і пацалаваў яго, і сказаў: «Вось,
памазаў цябе ГОСПАД на правадыра спадчыны Сваёй.
2 Калі пойдзеш сёньня ад мяне, сустрэнеш двух чалавек каля магілы Рахелі, недалёка ад
мяжы Бэн’яміна, у Цэльцаху. Яны скажуць табе: “Знайшліся асьліцы, якіх ты пайшоў шукаць.
А бацька твой, забыўшыся пра асьліцаў, хвалюецца за вас, кажучы: "Што сталася з сынам
маім?"”
3 Калі пойдзеш адтуль далей і прыйдзеш да дубровы Табор, сустрэнуць цябе тры мужчыны,
што ідуць у Бэтэль да Бога: адзін будзе несьці трох казьлянят, другі будзе несьці тры круглыя
хлябы, а трэці будзе несьці буклак віна.
4 Яны прывітаюць цябе і дадуць табе два хлябы, і ты возьмеш іх з рук іхніх.
5 І прыйдзеш на ўзгорак Божы, дзе знаходзяцца Філістынцы. Калі ўвойдзеш там у горад,
сустрэнеш грамаду прарокаў, якія зыходзяць з узгорку, а перад імі псалтыры, бубны, жалейкі
і гусьлі, а самі яны будуць прарочыць.
6 І зыйдзе на цябе Дух ГОСПАДА, і ты будзеш прарочыць разам з імі, і станеш чалавекам іхнім.
7 Калі зьдзейсьняцца ўсе гэтыя знакі, зрабі, што зможа рука твая, бо ГОСПАД будзе з табою.
8 І пойдзеш ты перад абліччам маім у Гільгал, а я прыйду да цябе, каб скласьці ахвяры
цэласпаленьня і ахвяры мірныя. Чакай мяне сем дзён, аж пакуль я прыйду да цябе, каб
навучыць цябе, што маеш рабіць».
9 І калі Саўл павярнуўся, каб адыйсьці ад Самуэля, Бог зьмяніў сэрца ягонае на іншае, і ў гэты
ж дзень зьдзейсьніліся ўсе знакі гэтыя.
10 І прыйшлі яны адтуль у Гіву, і вось грамада прарокаў выйшла насустрач яму. І зыйшоў на
яго Дух Божы, і ён стаў прарочыць між імі.
11 І калі ўсе, якія яго ведалі ўчора і пазаўчора, убачылі, што ён прарочыць разам з прарокамі,
пыталіся адзін аднаго: «Што гэта сталася з сынам Кіша? Няўжо і Саўл між прарокаў?»
12 І адказаў чалавек тамтэйшы, і сказаў: «Хто бацька іхні?» Дзеля таго зьявілася прымаўка:
«Няўжо і Саўл між прарокаў?»
13 І скончыў ён прарочыць, і пайшоў на ўзгорак.
14 І спытаўся дзядзька Саўла ў яго і ў слугі ягонага: «Куды вы хадзілі?» Ён адказаў: «Шукаць
асьліцаў. А калі іх не знайшлі, пайшлі мы да Самуэля».
15 І сказаў дзядзька Саўла: «Скажы мне, што сказаў табе Самуэль?»
16 І адказаў Саўл дзядзьку свайму: «Ён паведаміў нам, што знайшліся асьліцы». А адносна
размовы пра валадараньне, што гаварыў яму Самуэль, не сказаў яму.
17 І склікаў Самуэль народ да ГОСПАДА ў Міцпу,
18 і сказаў сынам Ізраіля: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я вывеў Ізраіля з Эгіпту, Я
выратаваў вас з рук Эгіпцянаў, і з рук усіх валадарстваў, якія зьдзекваліся над вамі.

19 А вы сёньня адкінулі Бога вашага, Які ратаваў вас ад усялякіх бедаў і трывогаў вашых, і
сказалі: "Пастаў над намі валадара!"" Дык цяпер станьце перад абліччам ГОСПАДА паводле
каленаў вашых і тысячаў вашых».
20 І загадаў Самуэль падыходзіць усім каленам Ізраіля, і выпала жэрабя на калена Бэн'яміна.
21 І загадаў Самуэль падыходзіць калену Бэн'яміна паводле сем'яў сваіх, і жэрабя выпала на
сям'ю Матры, і быў выбраны Саўл, сын Кіша. І шукалі яго, але не маглі знайсьці.
22 І спыталіся ў ГОСПАДА: «Ці чалавек гэты прыйшоў сюды?» І ГОСПАД сказаў: «Ён хаваецца
сярод рэчаў [у табары]».
23 І пабеглі, і прывялі яго адтуль. І стаў ён пасярод народу, і перавышаў ён увесь народ на
галаву.
24 І сказаў Самуэль усяму народу: «Ці бачыце таго, каго выбраў ГОСПАД? Бо няма яму роўнага
ў-ва ўсім народзе». І ўвесь народ загаманіў: «Няхай жыве валадар!»
25 І абвясьціў Самуэль народу пастанову адносна валадара, і запісаў гэта ў кнігу, і палажыў яе
перад абліччам ГОСПАДА. І адпусьціў Самуэль увесь народ, кожнага ў дом свой.
26 Таксама Саўл пайшоў у дом свой у Гіве. І пайшлі з ім ваяры, сэрцаў якіх дакрануўся Бог.
27 А сыны Бэліяла казалі: «Ці зможа ён нас выратаваць?» І пагардзілі ім, і не прынесьлі яму
падарункаў, але ён не зьвяртаў на гэта ўвагі.

1 Сам 11

1 І прыйшоў Нахаш Аманянін, і пачаў аблогу гораду Ябэш у Гілеадзе. І сказалі Нахашу ўсе
жыхары Ябэшу: «Заключы з намі запавет, і мы будзем служыць табе».
2 Нахаш Аманянін сказаў ім: «Я заключу з вамі запавет [з умовай], што кожнаму з вас я вырву
правае вока і выстаўлю вас на пасьмешышча перад усім Ізраілем»
3 І сказалі яму старшыні Ябэшу: «Дай нам сем дзён, каб мы маглі разаслаць пасланцоў у-ва
ўсе межы Ізраіля. І калі ніхто не дапаможа нам, мы выйдзем да цябе».
4 І прыйшлі пасланцы ў Гіву, горад Саўла, і сказалі слова гэтае ў вушы народу. І ўзьняў увесь
народ голас свой, і заплакаў.
5 А вось, Саўл гнаў валоў з поля. І сказаў Саўл: «Што [здарылася], што народ плача?» І
расказалі яму словы людзей з Ябэшу.
6 І зыйшоў на Саўла Дух Божы, калі пачуў ён словы гэтыя, і ахапіў яго гнеў вялікі.
7 І ўзяў ён пару валоў, і пасек іх на кавалкі, і паслаў праз рукі пасланцоў у-ва ўсе межы Ізраіля,
кажучы: «Хто ня выйдзе і ня пойдзе за Саўлам і Самуэлем, так станецца з яго валамі». І ахапіў
страх перад ГОСПАДАМ народ, і выйшлі яны ўсе, як адзін чалавек.
8 І ён палічыў іх у Бэзэку, і было трыста тысячаў сыноў Ізраіля, а ваяроў Юды было трыццаць
тысячаў.
9 І сказалі яны пасланцам, якія былі прыйшоўшы: «Так скажыце жыхарам Ябэшу Гілеадзкага:
"Заўтра, калі сонца прыгрэе, прыйдзем вас ратаваць"». І вярнуліся пасланцы, і расказалі гэта
жыхарам Ябэшу, і тыя ўзрадаваліся.
10 І сказалі жыхары Ябэшу [Нахашу]: «Раніцай мы выйдзем да вас, і вы зробіце з намі, што
будзе добра ў вачах вашых».
11 Назаўтра Саўл падзяліў народ на тры дружыны, і яны на сьвітаньні ўварваліся ў сярэдзіну
табару і забівалі Аманянаў аж да сьпякоты дня, а тыя, што засталіся, расьсеяліся так, што не
засталося з іх двух разам.
12 І сказаў народ Самуэлю: «Хто гэта казаў: "Ці можа Саўл валадарыць над намі?"? Аддайце
нам гэтых людзей, і мы заб'ем іх».
13 Але Саўл сказаў: «Ніхто не памрэ ў гэты дзень, бо сёньня ГОСПАД даў выратаваньне
Ізраілю».
14 А Самуэль сказаў народу: «Хадземце, пойдзем у Гільгал, і там абновім валадарства».
15 І пайшоў увесь народ у Гільгал, і паставілі валадаром Саўла перад абліччам ГОСПАДА ў
Гільгале, і там склалі ахвяры мірныя перад абліччам ГОСПАДА. І там радаваліся вельмі Саўл і
ўсе жыхары Ізраіля.

1 Сам 12

1 І сказаў Самуэль усяму Ізраілю: «Я выслухаў усё, што вы мне гаварылі, і паставіў над вамі
валадара.
2 Цяпер узначальвае вас гэты валадар. А я ўжо пастарэў і пасівеў, і сыны мае застаюцца з вамі.
І хадзіў я з вамі ад юнацтва майго аж да гэтага дня.
3 Вось, я стаю перад вамі. Абвінавачвайце мяне перад ГОСПАДАМ і перад памазанцам Ягоным,
можа, узяў я ў каго вала або асла, можа, каго пакрыўдзіў або каго прыгнятаў, а можа, ад каго
ўзяў хабар, каб заплюшчыць вочы на справу ягоную? Калі так, аднагараджуся вам».
4 Усе адказалі: «Не прыгнятаў ты нас, і ня крыўдзіў, і ніякага хабару ня ўзяў з нічыёй рукі».
5 І ён сказаў ім: «Няхай ГОСПАД будзе сьведкам супраць вас, і памазанец Ягоны ў гэты дзень
няхай будзе сьведкам, што ня знойдзена ў руцэ маёй нічога такога». Яны сказалі: «Ён —
сьведка».
6 І сказаў Самуэль народу: «Сведка — ГОСПАД, Які паставіў Майсея і Аарона і вывеў бацькоў
нашых з зямлі Эгіпецкай.
7 Цяпер падыйдзіце, і я буду судзіцца з вамі перад абліччам ГОСПАДА ў справе дабрадзействаў
ГОСПАДА, якія Ён учыніў для вас і для бацькоў вашых:
8 Калі прыйшоў Якуб у Эгіпет і калі клікалі бацькі вашыя ГОСПАДА, ГОСПАД паслаў Майсея і
Аарона, і яны вывелі бацькоў вашых з Эгіпту, і пасялілі іх у гэтым месцы.
9 Але яны забыліся пра ГОСПАДА, Бога свайго, і аддаў Ён іх у рукі Сісэры, начальніка войска
Хацора, у рукі Філістынцаў і ў рукі валадара Мааву, і яны ваявалі супраць іх.
10 І клікалі яны ГОСПАДА, і казалі: “Саграшылі мы, бо пакінулі ГОСПАДА, і служылі Баалам і
Астартам. Дык цяпер выратуй нас з рукі ворагаў нашых, і мы будзем служыць Табе”.
11 І паслаў ГОСПАД Еруббаала, Бэдана, Ефтаха і Самуэля, і вызваліў вас з рук ворагаў вашых
наўкола, і жылі вы ў бясьпецы.
12 Калі вы ўбачылі, што Нахаш, валадар сыноў Амона, прыйшоў да вас, вы сказалі мне: “Ня
[будзе так], але пастаў валадара над намі!” Але ж ГОСПАД, Бог ваш, — Валадар ваш.
13 І цяпер, вось валадар ваш, якога вы выбралі і якога прасілі, і вось, ГОСПАД даў вам валадара.
14 Калі вы будзеце баяцца ГОСПАДА, і будзеце служыць Яму, і будзеце слухаць голас Ягоны, і
ня будзеце непаслухмяныя [слову] з вуснаў ГОСПАДА, будзеце вы і валадар, які валадарыць
над вамі, на баку ГОСПАДА, Бога вашага.
15 А калі ня будзеце слухаць голас ГОСПАДА і будзеце непаслухмяныя [слову] з вуснаў
ГОСПАДА, тады рука ГОСПАДА будзе супраць вас, як была супраць бацькоў вашых.
16 І цяпер станьце і пабачце гэтую вялікую рэч, якую ўчыніць ГОСПАД на вачах вашых.
17 Ці ж ня сёньня жніво пшаніцы? Я паклічу ГОСПАДА, і Ён дасьць грымоты і дождж, і
вы даведаецеся і ўбачыце, што вялікая ліхота вашая ў вачах ГОСПАДА, бо вы прасілі сабе
валадара».
18 І клікаў Самуэль ГОСПАДА, і даў ГОСПАД грымоты і дождж у той дзень. І вельмі спужаўся
ўвесь народ ГОСПАДА і Самуэля.
19 І казаў увесь народ Самуэлю: «Маліся за слугаў тваіх да ГОСПАДА, Бога твайго, каб мы не
паўміралі, бо дадалі мы да ўсіх грахоў сваіх яшчэ і гэтае зло, бо прасілі сабе валадара».
20 І сказаў Самуэль народу: «Ня бойцеся! Вы дапусьціліся ўсяго гэтага зла, але не пакідайце
ГОСПАДА і служыце ГОСПАДУ ўсім сэрцам сваім.
21 Не адварочвайцеся [ад Яго] і не хадзіце за марнасьцямі, якія не дапамогуць вам і ня
выратуюць вас, бо яны — марнасьць.
22 Не пакіне ГОСПАД народу Свайго дзеля вялікага імя Свайго, бо захацеў ГОСПАД зрабіць вас
народам Сваім.
23 І я не хачу грашыць перад ГОСПАДАМ, і ня кіну маліцца за вас, і буду вучыць вас шляху
добраму і простаму.
24 Толькі бойцеся ГОСПАДА і служыце Яму ў праўдзе ўсім сэрцам вашым, бо вы бачылі, якія
вялікія [справы] Ягоныя сярод вас
25 А калі будзеце трываць у ліхоце, загінеце і вы, і валадар ваш».

1 Сам 13

1 Саўл меў гады, калі пачаў валадарыць, і два гады валадарыў над Ізраілем.
2 І выбраў Саўл сабе тры тысячы Ізраільцянаў, і з іх дзьве тысячы былі з Саўлам у Міхмашы і на
гары Бэтэль, а тысяча — з Ёнатанам у Гіве Бэн'ямінавай, а рэшту войска ён адпусьціў, кожнага
ў намёт свой.
3 І Ёнатан пабіў дружыну Філістынцаў, якая была ў Геве. І пачулі пра гэта Філістынцы, а Саўл
абвясьціў пра гэта гукам трубы ў-ва ўсёй зямлі, кажучы: «Няхай пачуюць Гебраі!»
4 І ўвесь Ізраіль пачуў вестку: «Пабіў Саўл дружыну Філістынцаў. Ізраіль стаўся ненавісным
для Філістынцаў». І сабраўся народ да Саўла ў Гільгал.
5 І Філістынцы сабраліся, каб ваяваць супраць Ізраіля: тры тысячы калясьніцаў і тры тысячы
коньнікаў, і народу мноства, як пяску на беразе мора. І разлажыліся яны табарам у Міхмашы
на ўсход ад Бэт-Авэну.
6 І ўбачылі ваяры Ізраіля, што яны ў небясьпецы, а народ быў вымучаны, і пахаваліся народ у
пячорах, шчылінах, скалах, ямах і ярах.
7 А [некаторыя] Гебраі пераправіліся праз Ярдан у зямлю Гада і ў Гілеад. А Саўл быў яшчэ ў
Гільгале, і ўвесь народ, які быў пры ім, дрыжаў [ад страху].
8 Сем дзён чакаў [Саўл] часу, вызначанага Самуэлем, аднак Самуэль не прыходзіў у Гільгал, і
народ стаў адыходзіць ад яго.
9 І сказаў Саўл: «Прынясіце мне ахвяру цэласпаленьня і ахвяру мірную». І склаў ён ахвяру
цэласпаленьня.
10 І скончыў ён складаць цэласпаленьне, і вось, прыйшоў Самуэль. І выйшаў Саўл яму на
спатканьне, каб прывітаць яго.
11 І сказаў Самуэль: «Што ты нарабіў?» Саўл сказаў: «Я бачыў, што народ адыходзіць ад мяне,
і ты не прыйшоў у вызначаны час. А Філістынцы сабраліся ў Міхмашы.
12 І я сказаў сабе: "Філістынцы нападуць на мяне ў Гільгале, а я не здабыў ласкі перад абліччам
ГОСПАДА". І змушаны, я склаў цэласпаленьне».
13 І сказаў Самуэль Саўлу: «Неразумна ты зрабіў. Ты не захаваў прыказаньне ГОСПАДА, Бога
твайго, якое Ён загадаў. Бо цяпер замацаваў бы ГОСПАД валадараньне тваё над Ізраілем на
вякі.
14 Але цяпер валадараньне тваё не патрывае. ГОСПАД знайшоў сабе чалавека паводле сэрца
Свайго і паставіў яго ГОСПАД правадыром народу Свайго, бо ты не захаваў таго, што загадаў
табе ГОСПАД».
15 І ўстаў Самуэль, і пайшоў з Гільгалу ў Гіву Бэн'ямінавую. А Саўл палічыў народ, што быў з
ім, і налічыў каля шасьцісот чалавек.
16 Саўл, і Ёнатан, сын ягоны, і народ, які быў з ім, сядзелі ў Гіве Бэн'ямінавай, а Філістынцы
стаялі табарам у Міхмашы.
17 З табару Філістынцаў выйшлі тры аддзелы, каб пустошыць [зямлю]; адзін аддзел
накіраваўся на шлях у Офру ў зямлю Шуал,
18 другі аддзел накіраваўся на шлях у Бэтхарон, а трэці аддзел пайшоў дарогаю да мяжы, што
ідзе ад даліны Цэвоім у пустыню.
19 А ў-ва ўсёй зямлі Ізраіля не было тады аніводнага каваля, бо Філістынцы казалі: «Няхай
Гебраі ня зробяць ані мяча, ані дзіды».
20 І прыходзілі ўсе Ізраільцяне да Філістынцаў, каб вастрыць плуг свой, сякеру, матыку або
серп.
21 І за вастрэньне плуга і сякеры плацілі дзьве трэці сыкля, і трэцюю частку сыкля за матыку
або серп.
22 І сталася, што ў час вайны ніхто з людзей, якія былі з Саўлам і Ёнатанам, ня меў ані мяча,
ані дзіды; мелі іх [толькі] Саўл і Ёнатан, сын ягоны.
23 І пайшла варта Філістынская да пераходу каля Міхмашу.

1 Сам 14

1 Аднаго дня Ёнатан, сын Саўла, сказаў юнаку, які насіў зброю ягоную: «Хадзем, падыйдзем

да варты Філістынцаў, якая насупраць». А бацьку свайму не сказаў пра гэта.
2 А Саўл сядзеў каля мяжы Гівы пад дрэвам гранатовым у Мігроне. Пры ім быў народ у ліку
шэсьцьсот чалавек.
3 І Ахія, сын Ахітува, брата Іхавода, сына Пінхаса, сына Гэлія, сьвятара ГОСПАДА ў Шыло, насіў
тады эфод. А народ ня ведаў, што Ёнатан пайшоў.
4 Паміж узвышшамі, якія хацеў прайсьці Ёнатан, каб дабрацца да варты Філістынцаў, на адным
і другім баку былі скалы, з якіх адна называлася Бацэц, а другая Сэннэ.
5 Адна скала ўзьнімалася на поўначы насупраць Міхмашу, а другая — на поўдні насупраць
Гівы.
6 І сказаў Ёнатан юнаку, збраяносцу свайму: «Хадзем, падыйдзем да варты гэтых неабрэзаных.
Можа, ГОСПАД дапаможа нам, бо ГОСПАДУ ня цяжка ратаваць праз многіх ці праз некалькіх».
7 Збраяносец сказаў яму: «Рабі ўсё, што ў сэрцы тваім. Ідзі, куды хочаш, вось, я з табою паводле
намеру сэрца твайго».
8 Кажа яму Ёнатан: «Вось, мы падыйдзем да гэтых людзей і пакажамся ім.
9 Калі яны скажуць нам: “Стойце, пакуль мы падыйдзем да вас”, мы будзем стаяць на месцы
сваім і ня будзем падыходзіць да іх.
10 А калі яны скажуць: “Хадзіце да нас”, мы пойдзем, бо выдаў іх ГОСПАД у рукі нашыя. Гэта
будзе нам знакам».
11 І паказаліся яны абодва варце Філістынцаў. І сказалі Філістынцы: «Вось, Гебраі выходзяць з
пячораў, у якіх яны схаваліся».
12 І людзі з варты зьвярнуліся да Ёнатана і слугі ягонага, кажучы: «Хадзіце да нас, скажам вам
нешта». І сказаў Ёнатан слузе свайму: «Ідзі за мною, бо ГОСПАД аддаў іх у рукі Ізраіля».
13 І так узлазіў Ёнатан, чапляючыся рукамі і нагамі, а збраяносец ягоны за ім. І падалі ворагі
перад Ёнатанам, а збраяносец ягоны дабіваў іх, ідучы за ім.
14 І была гэта першая параза, калі Ёнатан і збраяносец ягоны забілі каля дваццаці чалавек на
палове палетка, які [пара валоў] за дзень заарэ.
15 І ахапіў страх табар у полі і ўвесь народ; варта і аддзелы, што ішлі, каб пустошыць,
аслупянелі. І задрыжэла зямля, і ахапіў іх страх вялікі.
16 І вартаўнікі Саўла, якія былі ў Гіве Бэн’яміна, убачылі, што мноства людзей кідаліся туды і
сюды, уцякаючы.
17 І Саўл загадаў людзям, што з ім былі: «Праверце і паглядзіце, каго ў нас не хапае?» І
праверылі, і вось, няма Ёнатана і збраяносца ягонага.
18 І сказаў Саўл Ахію: «Прынясі Каўчэг Божы». Бо быў Каўчэг Божы ў той дзень у сыноў Ізраіля.
19 І калі Саўл размаўляў са сьвятаром, у табары Філістынцаў замяшаньне яшчэ больш
узрастала і пашыралася. І сказаў Саўл сьвятару: «Апусьці руку тваю».
20 І склікаў Саўл усіх людзей, якія з ім, і яны пайшлі на [месца] бою. І вось, [там] меч кожнага
быў зьвернуты супраць бліжняга свайго, і замяшаньне было вялікае.
21 І Гебраі, якія былі з Філістынцамі ўчора і пазаўчора і якія прыйшлі з імі ў табар з ваколіцаў,
паперaходзілі да Ізраільцянаў, якія былі з Саўлам і Ёнатанам.
22 І ўсе іншыя Ізраільцяне, якія хаваліся на гары Эфраіма, чуючы, што Філістынцы ўцякаюць,
далучыліся да сваіх у баі.
23 І збавіў ГОСПАД у той дзень Ізраіля. А бой ішоў аж да Бэт-Авэну.
24 І былі Ізраільцяне змучаныя ў той дзень, а Саўл запрысяг народ, кажучы: «Няхай будзе
пракляты чалавек, які будзе есьці хлеб перад вечарам, пакуль я не адпомшчу ворагам сваім!»
І ўвесь народ не пакаштаваў хлеба.
25 І ўвесь народ увайшоў у лес, а там быў мёд на паляне.
26 І ўвайшоў народ у лес, і вось, сьцякае мёд, але ніхто ня выцягнуў рукі сваёй да вуснаў сваіх,
бо баяўся народ прысягі.
27 А Ёнатан ня чуў, як бацька ягоны зьвязаў народ прысягай. І выцягнуў ён канец кія, які
[быў] у руцэ ягонай, і ткнуў ім у плястар мёду, і паднёс да вуснаў рукою сваёю, і вочы ягоныя
заясьнелі.

28 І адказаў з народу, і сказаў: «Бацька твой запрысяг народ, кажучы: “Пракляты чалавек, які
сёньня будзе есьці хлеб”. А народ вельмі змучаны».
29 І сказаў Ёнатан: «Замучыў бацька мой зямлю! Бачыце, як заясьнелі вочы мае, калі я крыху
пакаштаваў мёду гэтага.
30 Калі б народ падсілкаваўся сёньня са здабычы ворагаў сваіх, якую здабыў, большай была б
параза Філістынцаў».
31 У той дзень білі яны Філістынцаў ад Міхмашу аж да Аялону, хоць народ быў вельмі змучаны.
32 І кінуўся народ на здабычу, і набраў авечак, валоў і цялят, і рэзалі іх на зямлі, і елі разам з
крывёю.
33 І паведамілі Саўлу, кажучы: «Народ грашыць перад ГОСПАДАМ, ядучы [мяса] з крывёю» Ён
сказаў: «Вы дапусьціліся ліхоты. Прыкаціце да мяне вялікі камень».
34 І сказаў Саўл: «Разыйдзіцеся між людзей і скажыце ім: “Няхай прывядзе да мяне кожны
вала свайго або барана і заб’е яго на гэтым камяні, і будзе есьці, і ня будзе грашыць перад
ГОСПАДАМ, ядучы разам з крывёю”». І ўвесь народ прыводзіў, што меў у руцэ сваёй у тую ноч,
і забівалі там.
35 І пабудаваў Саўл ахвярнік ГОСПАДУ. Гэта быў першы ахвярнік, які ён пабудаваў ГОСПАДУ.
36 І сказаў Саўл: «Нападзем на Філістынцаў уначы, і зьнішчым іх да сьвятла раніцы, і не
пакінем з іх аніводнага». І [народ] сказаў: «Усё, што добрае ў вачах тваіх, рабі». А сьвятар
сказаў: «Наблізімся тут да Бога».
37 І пытаўся Саўл у Бога: «Ці ісьці ў пагоню за Філістынцамі? Ці Ты аддасі іх у рукі Ізраіля?» І
не адказаў яму [Бог] у той дзень.
38 І сказаў Саўл: «Зьбярыцеся сюды, усе начальнікі народу, і даведайцеся, і пабачце, хто ўчыніў
грэх у гэты дзень.
39 Бо, як жывы ГОСПАД, Збаўца Ізраіля, хоць бы праз Ёнатана, сына майго, сталася гэта, няхай
сьмерцю памрэ». І ніхто з усяго народу не запярэчыў яму.
40 І сказаў ён усяму Ізраілю: «Вы станьце з аднаго боку, а я і Ёнатан, сын мой, станем з другога».
І сказаў народ Саўлу: «Што добрае ў вачах тваіх, рабі».
41 І сказаў Саўл ГОСПАДУ: «Божа Ізраіля, пакажы беззаганнага». І выяўлены былі Ёнатан і
Саўл, а народ выйшаў [бязьвінным].
42 І сказаў Саўл: «Кідайце жэрабя паміж мною і сынам маім Ёнатанам». І жэрабя выпала на
Ёнатана.
43 І сказаў Саўл Ёнатану: «Скажы мне, што ты зрабіў?» І Ёнатан адказаў, і сказаў: «Я
пакаштаваў канцом кія, які ў руцэ маёй, крыху мёду, і вось, мушу памерці».
44 І сказаў Саўл: «Няхай гэта зробіць мне Бог, і тое дадасьць, ты павінен памерці, Ёнатане».
45 І сказаў народ Саўлу: «Ці ж мусіць памерці Ёнатан, які даў такую вялікую перамогу Ізраілю?
Няхай гэта будзе далёка [ад нас]! Як жывы ГОСПАД, не спадзе на зямлю і волас з галавы ягонай,
бо ён сёньня дзейнічаў з Богам». І народ абараніў Ёнатана, і ён не памёр.
46 І вярнуўся Саўл з пагоні за Філістынцамі, і яны пайшлі ў сядзібы свае.
47 А Саўл, умацаваў валадараньне сваё над Ізраілем і ваяваў наўкола з усімі ворагамі сваімі:
з Маавам, з сынамі Амона, з Эдомам, з валадаром Цобы і Філістынцамі. І куды толькі ён
паварочваўся, усюды перамагаў.
48 І ён дзейнічаў мужна, і пабіў Амалека, і выратаваў Ізраіля з рук тых, якія рабавалі яго.
49 Саўл меў сыноў: Ёнатана, Ішві і Малькішуа. А імёны дзьвюх дочак ягоных: імя старэйшай
— Мэраб, а імя малодшай — Міхаль.
50 А імя жонкі Саўла — Ахіноам, дачка Ахімааца. А імя начальніка войска ягонага — Абнэр,
сын Нэра, дзядзькі Саўла.
51 А Кіш, бацька Саўла, і Нэр, бацька Абнэра, [былі] сынамі Абіэля.
52 І ў-ва ўсе дні Саўла ішла зацятая вайна з Філістынцамі. І калі бачыў Саўл нейкага магутнага
чалавека, здольнага да бою, забіраў яго да сябе.

1 Сам 15

1 І сказаў Самуэль Саўлу: «ГОСПАД паслаў мяне памазаць цябе валадаром для народу Ягонага,
Ізраіля. І цяпер паслухай голас словаў ГОСПАДА.
2 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Узважыў Я, што зрабіў Амалек Ізраілю, як перашкаджаў яму
ў дарозе, калі [Ізраіль] ішоў з Эгіпту.
3 І цяпер ідзі, і пабі Амалека, і палажы закляцьце на ўсё, што ён мае. Не шкадуй яго, але забівай
ад мужчыны аж да жанчыны, ад малога аж да немаўляці, валоў і авечак, вярблюдаў і аслоў».
4 І склікаў Саўл народ, і палічыў яго ў Тэляме, дзьвесьце тысячаў пяхотнікаў і дзесяць тысячаў
ваяроў Юды.
5 І пайшоў Саўл да гораду Амалека, і зрабіў засаду ў лагчыне.
6 І сказаў Саўл Кенэям: «Адыйдзіцеся, аддзяліцеся і выйдзіце спаміж Амалека, каб разам з імі
я не загубіў і вас. Бо вы зьявілі міласэрнасьць усім сынам Ізраіля, калі яны ішлі з Эгіпту». І
выйшлі Кенэі спаміж Амалека.
7 І пабіў Саўл Амалека ад Хавілі аж да Шуру, які перад Эгіптам.
8 І схапіў ён Агага, валадара Амалекскага, жывога, а ўвесь народ пабіў вострывам мяча,
палажыўшы закляцьце.
9 І пашкадавалі Саўл і народ Агага і статкі найлепшых авечак і валоў, і адкормленай жывёлы,
бараноў і ўсяго адборнага, і не хацелі нішчыць іх. А на ўсё, што было марным і хворым, яны
палажылі закляцьце.
10 І было слова ГОСПАДА да Самуэля, кажучы:
11 «Шкадую, што Я паставіў Саўла валадаром, бо адступіўся ён ад Мяне і не выконвае словы
Мае». І засмуціўся Самуэль, і ўсю ноч клікаў да ГОСПАДА.
12 І ўстаў Самуэль раніцай, каб наведаць Саўла, і паведамілі Самуэлю: «Саўл пайшоў у
Кармэль, і вось, ён там паставіў сабе памятку [перамогі], і вярнуўся, і пайшоў, і зыйшоў у
Гільгал».
13 І прыйшоў Самуэль да Саўла, і сказаў яму Саўл: «Няхай дабраславіць цябе ГОСПАД. Я
выканаў слова ГОСПАДА».
14 І сказаў Самуэль: «Што гэта за голас авечак у вушах маіх, і што гэта за голас валоў, які я
чую?»
15 І Саўл сказаў: «Гэта мы прывялі іх ад Амалека. Бо пашкадаваў народ лепшых авечак і валоў,
каб пасьля скласьці іх у ахвяру ГОСПАДУ, Богу твайму, а астатніх мы [зьнішчылі] закляцьцем».
16 І сказаў Самуэль Саўлу: «Досыць! Я паведамлю табе, што мне сказаў ГОСПАД у гэтую ноч».
Сказаў яму [Саўл]: «Гавары!»
17 І сказаў Самуэль: «Ці не малым ты быў у вачах сваіх, а стаўся ты галавой каленаў Ізраіля. І
памазаў цябе ГОСПАД на валадара для Ізраіля,
18 і паслаў цябе ГОСПАД у дарогу, і сказаў: “Ідзі, і палажы закляцьце на Амалека, і ваюй з ім аж
да вынішчэньня яго”.
19 Дык чаму ты не паслухаў голас ГОСПАДА, чаму кінуўся на здабычу і ўчыніў ліхоту ў вачах
ГОСПАДА?»
20 І сказаў Саўл Самуэлю: «Я паслухаў голас ГОСПАДА, і пайшоў у дарогу, у якую паслаў мяне
ГОСПАД. І я прывёў Агага, валадара Амалекскага, і Амалека вынішчыў закляцьцем.
21 А народ узяў са здабычы авечак і валоў, як пяршыны іхнія, каб скласьці іх у ахвяру ГОСПАДУ,
Богу твайму, у Гільгале».
22 І сказаў Самуэль: «Ці ж ГОСПАД хоча цэласпаленьняў і ахвяраў крывавых больш,
чым паслухмянасьці голасу ГОСПАДА? Лепш паслухмянасьць, чым ахвяры крывавыя, і
пакорнасьць лепш, чым [ахвяра] з тлушчу бараноў.
23 Бо непакорнасьць — [такі самы] грэх, як варажба, а сваволя — як пакланеньне ідалам. За
тое, што ты адкінуў слова ГОСПАДА, Ён адкінуў цябе, як валадара».
24 І сказаў Саўл Самуэлю: «Саграшыў я, бо парушыў [слова] з вуснаў ГОСПАДА і словы твае, бо
я баяўся народу і паслухаў голас іхні.
25 Дык цяпер здымі з мяне грэх мой і вярніся са мной, каб я пакланіўся ГОСПАДУ».

26 І сказаў Самуэль Саўлу: «Не вярнуся з табой, бо ты адкінуў слова ГОСПАДА, і ГОСПАД адкінуў
цябе, каб ты ня быў валадаром для Ізраіля».
27 І павярнуўся Самуэль, каб ісьці, але Саўл схапіў за крысо плашча ягонага, і разьдзёр [яго].
28 І сказаў яму Самуэль: «Аддзярэ ГОСПАД валадарства Ізраіля ад цябе сёньня і перадасьць яго
бліжняму твайму, лепшаму за цябе.
29 Хвала Ізраіля ня хлусіць і не шкадуе, бо гэта не чалавек, каб шкадаваць [пра дзеі свае]».
30 І сказаў [Саўл]: «Саграшыў я. Але ўшануй мяне перад старшынямі народу майго і перад
Ізраілем. Вярніся са мной, каб я пакланіўся ГОСПАДУ, Богу твайму».
31 І вярнуўся Самуэль з Саўлам, і Саўл пакланіўся ГОСПАДУ.
32 І сказаў Самуэль: «Прывядзіце да мяне Агага, валадара Амалекскага». І падыйшоў да яго
Агаг, дрыжучы, і сказаў Агаг: «Сапраўды, адступіла [ад мяне] горыч сьмерці».
33 А Самуэль сказаў: «Як меч твой пазбаўляў жанчынаў дзяцей іхніх, так між жанчынамі маці
твая застанецца без дзяцей». І забіў Самуэль Агага перад абліччам ГОСПАДА ў Гільгале.
34 І пайшоў Самуэль у Раму, а Саўл вярнуўся ў дом свой у Гіве Саўлавай.
35 Ад гэтага часу Самуэль ня бачыўся з Саўлам аж да дня сьмерці сваёй. І сумаваў Самуэль
дзеля Саўла, бо ГОСПАД шкадаваў, што паставіў Саўла валадаром над Ізраілем.

1 Сам 16

1 І сказаў ГОСПАД Самуэлю: «Дакуль ты будзеш сумаваць дзеля Саўла, якога Я адкінуў, каб
ён ня быў валадаром над Ізраілем. Напоўні рог свой алеем і ідзі. Я пасылаю цябе да Есэя з
Бэтлеему, бо сярод сыноў ягоных Я ўбачыў для Сябе валадара».
2 І сказаў Самуэль: «Як я пайду? Пачуе пра гэта Саўл і заб'е мяне». І сказаў яму ГОСПАД:
«Возьмеш з сабою ялаўку і скажаш: "Іду скласьці ахвяру ГОСПАДУ".
3 І запросіш Есэя на ахвяру, а Я дам табе ведаць, што маеш рабіць, і ты памажаш таго, пра каго
Я скажу табе».
4 І зрабіў Самуэль так, як ГОСПАД прамовіў. І прыйшоў ён у Бэтлеем. І напалохаліся старшыні
гораду, сустрэўшы яго, і спыталіся: «Ці мірны прыход твой?»
5 Ён сказаў: «Мірны. Я прыйшоў, каб скласьці ахвяру ГОСПАДУ. Асьвяціцеся і хадзіце са мною
скласьці ахвяру». І асьвяціў Есэя і сыноў ягоных, і паклікаў іх на ахвяру.
6 І прыйшлі яны, і ўбачыў Самуэль Эліява, і сказаў: «Без сумніву, перад ГОСПАДАМ памазанец
Ягоны!»
7 Але ГОСПАД сказаў Самуэлю: «Не глядзі на выгляд ягоны, ані на высокі рост ягоны, бо Я
яго адкінуш. Бо Я [гляджу] ня так, як глядзіць чалавек, бо чалавек бачыць вачыма, а ГОСПАД
бачыць сэрца».
8 І паклікаў Есэй Абінадава, і прывёў яго перад аблічча Самуэля, але ён сказаў: «Ня гэтага
выбраў ГОСПАД».
9 І прывёў Есэй Шамму, але сказаў [Самуэль]: «І гэтага ня выбраў ГОСПАД».
10 І прыводзіў Есэй сем сыноў сваіх да Самуэля, але Самуэль казаў Есэю: «Ня выбраў ГОСПАД
анікога з іх».
11 І сказаў Самуэль Есэю: «Ці гэта ўсе хлопцы твае?» Ён адказаў: «Застаўся яшчэ адзін,
найменшы, ён пасьвіць авечкі». І сказаў Самуэль Есэю: «Пашлі па яго і прывядзі яго. Не
пачнем [бяседы], пакуль ён ня прыйдзе».
12 І паслаў ён па яго, і прывёў яго, а быў ён руды, меў прыгожыя вочы і зграбную постаць. І
сказаў ГОСПАД [Самуэлю]: «Устань, памаж яго, бо гэта ён».
13 І ўзяў Самуэль рог з алеем, і памазаў яго ў прысутнасьці братоў ягоных. І зыйшоў на Давіда
Дух ГОСПАДА ад таго дня. А Самуэль падняўся і вярнуўся ў Раму.
14 І пакінуў Дух ГОСПАДА Саўла, і авалодаў ім дух ліхі ад ГОСПАДА.
15 І сказалі Саўлу слугі ягоныя: «Мучыць цябе ліхі дух ад Бога.
16 Гаспадару наш, дай загад, і слугі твае, якія пры табе, адшукаюць чалавека, які грае на
гусьлях, каб ён, калі будзе цябе мучыць дух ліхі ад Бога, граў табе рукою сваёю, і будзе добра
табе».

17 І сказаў Саўл слугам сваім: «Знайдзіце мне чалавека, які грае добра на гусьлях, і прывядзіце
яго да мяне».
18 І адказаў адзін з юнакоў, і сказаў: «Вось, я бачыў сына Есэя з Бэтлеему, які ўмее граць на
гусьлях. Ён — чалавек мужны і дужы, моцны ў слове, і прыгожы, і ГОСПАД ёсьць з ім».
19 І паслаў Саўл пасланцоў да Есэя, і сказаў: «Прышлі да мяне Давіда, сына твайго, які пасьвіць
авечак».
20 І ўзяў Есэй пяць хлябоў, буклак з віном і адно казьляня, і паслаў праз Давіда, сына свайго,
Саўлу.
21 І прыйшоў Давід да Саўла, і стаў перад ім. І Саўл палюбіў яго вельмі, і стаўся ён у яго
збраяносцам.
22 І паслаў Саўл да Есэя, кажучы: «Давід застанецца ў мяне, бо ён знайшоў ласку ў вачах маіх».
23 І, калі дух, [спасланы] Богам, агартаў Саўла, Давід браў гусьлі і граў рукою сваёй. І Саўлу
была палёгка, і ён адчуваў сябе добра, бо адступаўся ад яго ліхі дух.

1 Сам 17

1 І сабралі Філістынцы войскі свае на вайну, і сабраліся ў Соха, што ў Юдэі, і разлажыліся
табарам між Соха і Азэкаю ў Эфэс-Даміме.
2 А Саўл і ваяры Ізраільскія сабраліся і разлажыліся табарам у лагчыне Эла, і пашыхтаваліся
да бою супраць Філістынцаў.
3 Філістынцы стаялі на схіле гары з аднаго боку, а Ізраільцяне — на схіле гары з другога боку,
і разьдзяляла іх лагчына.
4 І выйшаў з шыхтоў Філістынцаў чалавек на імя Галіят з Гату, а быў ён вышынёю ў шэсьць
локцяў і адну пядзю.
5 На галаве ён меў мядзяны шалом, адзеты быў у лускаты мядзяны панцыр у пяць тысячаў
сыкляў вагі,
6 а на нагах меў ён мядзяныя накаленьнікі, і мядзяны меч за плячыма.
7 Тронак дзіды ягонай быў як навой ткацкі, а вострыва дзіды ягонай важыла шэсьцьсот сыкляў
жалеза. Перад ім ішоў [збраяносец], несучы шчыт.
8 І стаў ён насупраць шыхтоў Ізраіля, і крычаў, і казаў ім: «Чаго вы прыйшлі падрыхтаваныя
да бою? Ці ж я не Філістынец, і вы — ці ня слугі Саўла? Выберыце спаміж сябе некага, і няхай
ён зыйдзе да мяне!
9 Калі зможа ён ваяваць са мною і пераможа мяне, мы будзем нявольнікамі вашымі. А калі я
перамагу, і заб'ю яго, вы будзеце нявольнікамі і будзеце нам служыць».
10 І сказаў Філістынец: «Вось, я зьневажаю сёньня дружыны Ізраіля. Дайце мне чалавека, і мы
будзем біцца!»
11 І чулі гэтыя словы Філістынца Саўл і ўвесь Ізраіль, і напалохаліся, і вельмі баяліся.
12 А Давід быў сынам Эфрацяніна з Бэтлеему Юдэйскага, імя ягонае — Есэй. Ён меў восем
сыноў і ў часы Саўла быў ужо старым і ў гадах пажылых.
13 Тры старэйшыя сыны ягоныя пайшлі з Саўлам ваяваць. Імёны тых трох сыноў ягоных, якія
пайшлі на вайну, былі: першародны Эліяў, другі — Абінадаў, а трэці — Шамма.
14 Давід жа быў найменшым. А тры старэйшыя пайшлі за Саўлам.
15 Давід прыходзіў да Саўла і адыходзіў, каб пасьвіць авечак бацькі свайго ў Бэтлееме.
16 А Філістынец выходзіў раніцаю і ўвечары, і выходзіў гэтак сорак дзён.
17 І сказаў Есэй сыну свайму Давіду: «Вазьмі для братоў тваіх эфу пражаных зярнят і дзесяць
хлябоў, і занясі хутка братам тваім у табар!
18 І занясі дзесяць кавалкаў сыру для тысячніка, і адведай братоў тваіх, як маюцца, і даведайся
патрэбы іхнія».
19 А Саўл і яны, і ўсе сыны Ізраіля ваявалі з Філістынцамі ў лагчыне Эла.
20 І ўстаў Давід раніцаю, і даручыў авечак вартаўніку, і забраў [пасілкі], і пайшоў, як загадаў
яму Есэй. І прыйшоў ён у табар, і войска выходзіла ў шыхтах з баявым крыкам.
21 І сталі ў шыхт Ізраільцяне і Філістынцы адны супраць другіх.

22 Давід, скінуўшы з сябе ношу і аддаўшы яе варце ў табары, пабег да дружынаў. І прыбег, і
прывітаў братоў сваіх.
23 Калі ён размаўляў з імі, вось, выйшаў з шыхтоў той чалавек на імя Галіят, Філістынец з Гату,
і гаварыў тыя самыя словы. І пачуў [гэта] Давід.
24 А ўсе ваяры Ізраільскія, убачыўшы яго, уцякалі ад яго са страхам вялікім.
25 І сказаў адзін з Ізраільцянаў: «Ці бачыце вы чалавека гэтага, які выходзіць? Ён выходзіць,
каб зьневажаць Ізраіля. Дык чалавека, які заб'е яго, валадар узнагародзіць багацьцямі
вялікімі, і дачку сваю дасьць за жонку, а дом бацькі ягонага вызваліць [ад падатку] ў Ізраілі».
26 І сказаў Давід людзям, што стаялі каля яго, кажучы: «Што дадуць чалавеку, які заб'е
Філістынца гэтага і здыме ганьбу з Ізраіля? Бо хто ён, гэты неабрэзаны Філістынец, што так
насьміхаецца з войска Бога Жывога?»
27 І сказалі людзі тыя самыя словы, кажучы: «Так зробіць [валадар] чалавеку, які заб'е яго».
28 І пачуў Эліяў, старэйшы брат ягоны, як ён гаварыў пра гэта з іншымі, і загневаўся Эліяў на
Давіда, і сказаў: «Навошта ты прыйшоў і каму пакінуў той малы статак у пустыні ? Я ведаю
пыху тваю і ліхоту сэрца твайго, бо ты прыйшоў сюды, каб паглядзець на вайну».
29 І сказаў Давід: «Што я такога зрабіў? Ці ж няможна пра гэта гаварыць?»
30 І адвярнуўся ад яго да іншага, і спытаў тое самае. І людзі адказалі яму тыя словы, што і
раней.
31 І пачулі словы, якія гаварыў Давід, і пераказалі Саўлу, і ён паклікаў яго.
32 І сказаў Давід Саўлу: «Няхай ніхто ня падае сэрцам з прычыны [Філістынца]. Слуга твой
пойдзе і будзе змагацца супраць Філістынца гэтага».
33 І сказаў Саўл Давіду: «Ня можаш ты ісьці супраць Філістынца гэтага і змагацца супраць яго,
бо ты — юнак, а ён — ваяр ад маладосьці сваёй».
34 І сказаў Давід Саўлу: «Слуга твой пасьвіў авечак бацькі свайго, і прыходзіў леў ці мядзьведзь,
і хапаў барана спаміж статку,
35 а я даганяў яго, біў і вырываў [авечку] з пашчы ягонай. А калі ён выходзіў на мяне, я хапаў
яго за сківіцу, і перамагаў яго, і забіваў яго.
36 Нават льва і мядзьведзя перамагаў слуга твой. І гэты неабрэзаны Філістынец [будзе] як адзін
з іх, бо ён насьміхаецца з войска Бога Жывога!»
37 І сказаў Давід: «ГОСПАД, Які выратаваў мяне з кіпцюроў льва і мядзьведзя, выратуе мяне і
ад рукі Філістынца гэтага». І сказаў Саўл Давіду: «Ідзі, і няхай ГОСПАД будзе з табою».
38 І апрануў Саўл Давіда ў адзеньне сваё, і даў мядзяны шалом на галаву ягоную, і адзеў у
панцыр.
39 І падперазаўся Давід мячом ягоным кругом адзеньня, і паспрабаваў хадзіць, бо ня меў
[яшчэ] спрактыкаванасьці. І сказаў Давід Саўлу: «Не магу я хадзіць у гэтым, бо нязвыкла мне».
І скінуў Давід [усё] з сябе.
40 І ўзяў ён у руку сваю кій свой, і выбраў сабе пяць гладкіх камянёў з ручая, і ўлажыў іх у торбу
пастуха, якую меў замест кішэняў, і з пушчалкай у руцэ сваёй накіраваўся да Філістынца.
41 А Філістынец ішоў і набліжаўся да Давіда, і збраяносец нёс шчыт перад ім.
42 І глянуў Філістынец, і ўбачыў Давіда, і пагардзіў ім, бо быў ён яшчэ хлопец, руды і прыгожы
тварам.
43 І сказаў Філістынец Давіду: «Ці ж я сабака, што ты ідзеш да мяне з кіем?» І пракляў
Філістынец Давіда багамі сваімі.
44 І сказаў Філістынец Давіду: «Хадзі да мяне, і я аддам цела тваё птушкам паднебным і
зьвярам палявым».
45 А Давід сказаў Філістынцу: «Ты ідзеш на мяне з мячом, і дзідай, і шчытом, а я іду на цябе ў
імя ГОСПАДА Магуцьцяў, Бога войска Ізраіля, з якога ты насьміхаўся.
46 Сёньня аддасьць цябе ГОСПАД у рукі мае, і я перамагу цябе, і адсяку табе галаву тваю, і аддам
трупы табару Філістынцаў сёньня птушкам паднебным і зьвярам зямным, і няхай ведае ўся
зямля, што ёсьць Бог у Ізраіля.

47 Няхай ведае ўся царква, што ГОСПАД не мячом і дзідай ратуе, бо гэта вайна ГОСПАДА, і Ён
выдасьць вас у рукі нашыя».
48 І калі Філістынец устаў, і пайшоў, і набліжаўся да Давіда, Давід хутка пабег на бой насустрач
Філістынцу.
49 І ўсунуў Давід руку сваю ў торбу, і ўзяў адтуль камень, і пусьціў яго [пушчалкай], і ўдарыў ім
Філістынца ў лоб. І засеў той камень паміж вачэй [Філістынца], і ён упаў аблічча на зямлю.
50 І перамог Давід Філістынца пушчалкай і камянём, і ўдарыў Філістынца, і забіў яго, і мяча не
было ў руцэ Давіда.
51 І падбег Давід, і стаў каля Філістынца, і ўзяў меч ягоны, і выцягнуў яго з похваў, і забіў яго,
і адсек галаву яму. І ўбачылі Філістынцы, што волат іхні мёртвы, і кінуліся ўцякаць.
52 А ваяры Ізраіля і Юды падняліся, і ўзьнялі гармідар ваенны, і кінуліся ў пагоню за
Філістынцамі аж да ўваходу ў даліну і да брамы Экрону. І трупы Філістынцаў ляжалі па дарозе
ад Шааараіму аж да Ґату і Экрону.
53 І вярнуліся сыны Ізраіля пасьля пагоні за Філістынцамі, і абрабавалі табар іхні.
54 А Давід узяў галаву Філістынца і занёс яе ў Ерусалім, а зброю ягоную палажыў у намёце
сваім.
55 Калі Саўл убачыў Давіда, які выходзіў насустрач Філістынцу, ён сказаў Абнэру, начальніку
войска: «Абнэр, чый сын юнак гэты?» І сказаў Абнэр: «Як жывая душа твая, валадару, ня
ведаю».
56 І сказаў валадар: «Запытайся, чый сын юнак гэты».
57 І калі, забіўшы Філістынца, Давід вярнуўся, узяў яго Абнэр, і прывёў да Саўла, і галава
Філістынца [была] ў руцэ ягонай.
58 І сказаў яму Саўл: «Чый ты сын, юнача?» І Давід сказаў: «Я — сын слугі твайго Есэя з
Бэтлеему».

1 Сам 18

1 І скончыў Давід размову з Саўлам, і душа Ёнатана прыхілілася да душы Давіда, і палюбіў яго
Ёнатан, як душу сваю.
2 І з таго дня ўзяў яго Саўл да сябе, і ня даў яму вярнуцца ў дом бацькі свайго.
3 І заключыў Ёнатан запавет з Давідам, бо палюбіў ён яго як душу сваю.
4 І зьняў з сябе Ёнатан шату, якая [была] на ім, і даў яе Давіду, і астатняе адзеньне сваё, і нават
меч, лук і пояс свой.
5 І хадзіў Давід усюды, куды пасылаў яго Саўл, і ўсюды меў посьпех. І паставіў яго Саўл
начальнікам над ваярамі, і ён быў добрым у вачах усяго народу, а таксама ў вачах слугаў Саўла.
6 І, калі ішлі [ваяры], калі вяртаўся Давід, перамогшы Філістынцаў, выходзілі жанчыны з
песьнямі і танцамі, з бубнамі і гусьлямі насустрач валадару Саўлу.
7 І танчылі жанчыны, і сьпявалі, паўтараючы: «Пабіў Саўл тысячы, а Давід — дзясяткі тысячаў».
8 І вельмі ўзлаваўся Саўл, і кепскімі былі ў вачах ягоных словы гэтыя, і ён сказаў: «Давіду
даюць дзясяткі тысячаў, а мне даюць толькі тысячы; яму толькі валадараньня не хапае».
9 Ад таго дня глядзеў Саўл на Давіда крывым вокам.
10 А на другі дзень апанаваў Саўла ліхі дух, [спасланы] Богам, і ён шалеў у доме сваім. І Давід
як штодзень граў на гусьлях, а Саўл трымаў дзіду ў руцэ.
11 І кінуў Саўл дзіду рукою сваёй, і сказаў: «Прыб'ю Давіда да сьцяны». Але Давід ухіліўся, і
было так два разы.
12 І баяўся Саўл Давіда, бо ГОСПАД быў з ім, а ад Саўла адвярнуўся.
13 І адсунуў Саўл яго ад сябе, і прызначыў яго тысячнікам, і ён выходзіў [на вайну] і хадзіў
перад аблічча народу.
14 І на ўсіх шляхах сваіх меў Давід посьпех, і ГОСПАД [быў] з ім.
15 І ўбачыў Саўл, што [Давіду] ўсё ідзе пасьпяхова, і меў страх перад ім.
16 А ўвесь Ізраіль і Юда любілі Давіда, бо ён выходзіў [на вайну] і хадзіў перад аблічча іхнім.

17 І сказаў Саўл Давіду: «Вось старэйшая дачка мая Мэраб. Я дам яе табе за жонку, але будзь у
мяне мужным [чалавекам] і вядзі войны ГОСПАДА». А Саўл казаў [сабе]: «Не мая рука будзе
супраць яго, але будзе супраць яго рука Філістынцаў».
18 І сказаў Давід Саўлу: «Хто я і якое жыцьцё маё, або якая сям'я бацькі майго ў Ізраілі, каб
быць мне зяцем валадара?»
19 Але калі наблізіўся час аддаць за Давіда Мэраб, дачку Саўла, яна была аддадзена за жонку
Адрыэлю з Мэхолы.
20 І [другая] дачка Саўла, Міхаль, пакахала Давіда. І паведамілі пра гэта Саўлу, і была гэтая
справа слушная ў вачах ягоных.
21 І сказаў Саўл: «Аддам яму яе, і будзе яна для яго пасткаю, і будзе супраць яго рука
Філістынцаў». І другі раз сказаў Саўл Давіду: «Сёньня будзеш зяцем маім».
22 І загадаў Саўл слугам сваім: «Пагаварыце з Давідам паціху, кажучы: “Вось, ты падабаешся
валадару, і ўсе слугі ягоныя любяць цябе, дык будзь зяцем валадара”».
23 І гаварылі гэтыя словы слугі Саўла ў вушы Давіду, і Давід сказаў: «Ці ж не малая гэта рэч у
вачах вашых, каб я стаў зяцем валадару? Я ж чалавек бедны і нязначны».
24 І паведамілі гэта слугі Саўлу, кажучы, якія словы казаў Давід.
25 І сказаў Саўл: «Так скажыце Давіду: “Валадар не патрабуе ніякай платы за нявесту, але
толькі сто скуравінак Філістынскіх, каб адпомсьціць ворагам валадара”». Бо думаў Саўл гэтак
выдаць Давіда ў рукі Філістынцаў.
26 І паведамілі слугі валадара Давіду словы гэтыя, і была слушная справа гэтая ў вачах Давіда,
каб стаць зяцем валадара.
27 Яшчэ ня скончыліся прызначаныя дні, а Давід устаў і пайшоў з ваярамі сваімі, і забіў
дзьвесьце Філістынцаў, і прынёс Давід скуравінкі іхнія, і адлічыў іх валадару, каб быць зяцем
валадара. І аддаў Саўл дачку сваю Міхаль за жонку яму.
28 І ўбачыў Саўл, і зразумеў, што ГОСПАД з Давідам, а Міхаль, дачка Саўла, кахае яго.
29 І тым больш пачаў Саўл баяцца Давіда, і стаўся Саўл ворагам Давіду ў-ва ўсе дні.
30 А валадары Філістынцаў выходзілі [ваяваць], але колькі разоў нападалі яны, Давід меў
посьпех большы, чым слугі Саўла, і вельмі слаўным сталася імя ягонае.

1 Сам 19

1 І намаўляў Саўл Ёнатана, сына свайго, і ўсіх слугаў сваіх, каб забілі Давіда, але Ёнатан, сын
Саўла, вельмі любіў Давіда.
2 І паведаміў Ёнатан Давіду, кажучы: «Саўл, бацька мой, хоча забіць цябе. Таму цяпер
сьцеражыся раніцаю, і схавайся, і не паказвайся.
3 А я пайду і стану каля бацькі ў полі, дзе ты будзеш, і буду гаварыць пра цябе бацьку майму, і
што ўбачу, раскажу табе».
4 І гаварыў Ёнатан добрае бацьку свайму Саўлу пра Давіда, і сказаў яму: «Няхай не грашыць
валадар адносна Давіда, слугі свайго, бо нічым ён не саграшыў перад табою, і ўчынкі ягоныя
для цябе заўсёды добрыя.
5 Ён палажыў на далоні свае душу сваю, і забіў Філістынца, і [праз яго] ГОСПАД даў вялікую
перамогу Ізраілю. Ты бачыў [гэта] і радаваўся. Дык чаму ты грашыш супраць крыві нявіннай,
хочучы забіць Давіда без прычыны?»
6 І выслухаў Саўл голас Ёнатана, і пакляўся Саўл: «Як жывы ГОСПАД, ня будзе ён забіты».
7 І паклікаў Ёнатан Давіда, і пераказаў яму ўсе гэтыя словы. І прывёў Ёнатан Давіда да Саўла,
і ён быў перад абдіччам ягоным як учора і пазаўчора.
8 І зноў пачалася вайна. І пайшоў Давід, і ваяваў супраць Філістынцаў, і зрабіў ім вялікую
паразу, і яны ўцяклі перад ім.
9 І зыйшоў на Саўла ліхі дух, [спасланы] ГОСПАДАМ, і сядзеў ён у доме сваім, і дзіда [была] ў
руцэ ягонай, а Давід граў рукою сваёй на гусьлях.
10 І спрабаваў Саўл прыбіць Давіда да сьцяны, але Давід ухіліўся перад Саўлам, і дзідаўбілася
ў сьцяну, а Давід уцёк і ўратаваўся ў тую ноч.

11 І паслаў Саўл слугаў сваіх у дом да Давіда, каб пільнавалі яго і забілі раніцаю. І паведаміла
пра гэта Давіду Міхаль, жонка ягоная, кажучы: «Калі не ўратуеш душу сваю ў гэтую ноч, заўтра
будзеш мёртвы».
12 І спусьціла Міхаль Давіда праз вакно, і ён пайшоў, і ўцёк, і быў уратаваны.
13 А Міхаль узяла балвана, і палажыла яго на ложак, а пад галаву ягоную падклала падушку з
казінай [поўсьці] і накрыла плашчом.
14 І паслаў Саўл пасланцоў, каб узялі Давіда, але яна сказала, што ён хворы.
15 І паслаў Саўл пасланцоў, каб адведалі Давіда, і сказаў: «Прынясіце да мяне яго ў ложку, каб
я забіў яго».
16 І прыйшлі слугі, і вось, балван на ложку, і падушка з [поўсьці] казінай на месцы галавы.
17 І сказаў Саўл Міхаль: «Навошта ты так падманула мяне і выпусьціла ворага майго, каб ён
мог уцячы?» Міхаль адказала Саўлу: «Бо ён сказаў мне: “Пусьці мяне, бо іначай заб’ю цябе”».
18 І Давід уцёк, і ўратаваўся, і пайшоў да Самуэля ў Раму, і паведаміў яму ўсё, што зрабіў яму
Саўл. І пайшлі адтуль ён і Самуэль, і затрымаліся ў Наёце.
19 І паведамілі Саўлу, кажучы: «Вось, Давід у Наёце каля Рамы».
20 І паслаў Саўл пасланцоў, каб схапілі Давіда. І яны ўбачылі грамаду прарокаў, якія
прарочылі, і Самуэля на чале іх, і зыйшоў на пасланцоў Саўла Дух Божы, і яны таксама пачалі
прарочыць.
21 І паведамілі Саўлу, і ён паслаў іншых пасланцоў, але яны таксама прарочылі. І зноў паслаў
Саўл пасланцоў трэці раз, але яны таксама прарочылі.
22 І ён сам пайшоў у Раму, і дайшоў да вялікай студні, якая ў Сэку. І пытаўся ён, і сказаў: «Дзе
Самуэль і Давід?» І сказалі [яму]: «Яны ў Наёце каля Рамы».
23 І пайшоў ён у Наёт каля Рамы, і Дух Божы зыйшоў на яго таксама, і ён ішоў, і ўсцяж прарочыў,
аж прыйшоў у Наёт каля Рамы.
24 І зьняў ён з сябе адзеньне сваё, і разам з іншымі прарочыў перад Самуэлем, і ляжаў голы
ўвесь дзень і ноч. Таму і гавораць: «Ці ж і Саўл між прарокаў?»

1 Сам 20

1 А Давід уцёк з Наёту каля Рамы, і пайшоў да Ёнатана, і сказаў яму: «Што я зрабіў, у чым мая
віна і чым я саграшыў адносна бацькі твайго, што ён цікуе на душу маю?»
2 [Ёнатан] сказаў яму: «Няхай будзе гэта далёка [ад цябе], ты не памрэш. Вось, бацька мой не
вырашае анічога важнага або няважнага, калі перш не параіцца са мною. Навошта такую рэч
ён хаваў бы перада мною? Ня будзе гэтага».
3 Але Давід запрысягся яшчэ і сказаў: «Ведаючы, ведае бацька твой, што я знайшоў ласку ў
вачах тваіх, і ён сказаў: “Няхай не даведаецца пра гэта Ёнатан, каб не сумаваў”. Але як жывы
ГОСПАД і як жывая душа твая, толькі адзін крок [аддзяляе] мяне ад сьмерці».
4 І сказаў Ёнатан Давіду: «Што толькі скажа душа твая, я зраблю табе».
5 І сказаў Давід Ёнатану: «Вось, маладзік, і я павінен сядзець каля валадара на банкеце. Дык
дазволь мне, і я схаваюся ў полі аж да трэцяга вечара.
6 Калі спытаецца бацька твой пра мяне, скажы: “Прасіў мяне Давід, каб заскочыць у Бэтлеем,
горад свой, бо ўся сям’я ягоная складае там ахвяру штогадовую”.
7 Калі ён скажа: “Добра”, будзе тады супакой слузе твайму, а калі разгневаецца, ведай, што
[нешта] ліхое ён вырашыў зрабіць.
8 Дык зьяві міласэрнасьць слузе твайму, бо ты заключыў запавет ГОСПАДА са слугою тваім.
Калі я ў чым вінаваты, ты забі мяне, але да бацькі свайго не вядзі мяне».
9 І сказаў Ёнатан: «Далёка гэта ад цябе! Калі даведаюся, што бацька мой вырашыў зрабіць табе
ліхое, ці ж я табе пра гэта не паведамлю?»
10 І сказаў Давід Ёнатану: «Хто паведаміць мне, калі бацька твой жорстка адкажа табе?»
11 І сказаў Ёнатан Давіду: «Хадзем, выйдзем у поле». І выйшлі яны абодва ў поле,

12 і сказаў Ёнатан Давіду: «[Сведка] ГОСПАД, Бог Ізраіля, што заўтра або пасьлязаўтра я
даведаюся ў бацькі свайго, і калі што добрае будзе адносна Давіда, а я не пашлю да цябе і не
паведамлю ў вушы твае,
13 няхай ГОСПАД гэтае зло зробіць Ёнатанату і тое дадасьць. А калі задумае ліхое бацька мой
супраць цябе, пра гэта я паведамлю ў вушы твае, і адпушчу цябе, і ты пойдзеш у супакоі. І
няхай ГОСПАД будзе з табою, як Ён быў з бацькам маім.
14 І калі я яшчэ буду жыць, ты зьявіш мне міласэрнасьць ГОСПАДА, і я не памру.
15 І ты не спыняй міласэрнасьці сваёй адносна дому майго на вякі, нават тады, калі ГОСПАД
прыбярэ ворагаў Давіда з аблічча зямлі».
16 І заключыў Ёнатан [запавет] з домам Давіда, [кажучы]: «Няхай ГОСПАД шукае [адказ за
душы] з рук ворагаў Давіда».
17 І яшчэ раз Ёнатан запрысяг Давіду любоў сваю, бо ён палюбіў яго, як душу сваю.
18 І сказаў яму Ёнатан: «Заўтра маладзік, і будуць цябе шукаць, бо месца тваё будзе пустым.
19 Таму на трэці дзень ты зыйдзі і прыйдзі на тое месца, дзе ты хаваўся раней, і затрымайся
каля камяня Эзэл.
20 А я пушчу ў бок ягоны тры стралы, нібы страляючы ў метку.
21 І вось, я пашлю юнака: “Ідзі і знайдзі стрэлы”. Калі скажу юнаку: “Вось, стрэлы перад табою,
вазьмі іх”, ты прыходзь да мяне, бо супакой табе, і няма нічога [кепскага], як жывы ГОСПАД.
22 А калі скажу хлопцу: “Стрэлы за табой”, ты ўцякай, бо ГОСПАД пасылае цябе [далёка].
23 А ў слове, якое мы сказалі, я і ты, няхай ГОСПАД будзе між мною і табой на вякі».
24 І схаваўся Давід у полі. І надыйшоў маладзік, і валадар банкетаваў пры стале.
25 І, як звычайна, сядзеў валадар на пасадзе сваім каля сьцяны, а Ёнатан насупраць, і Абнэр
сядзеў каля Саўла, і заўважылі, што месца Давіда [пустое].
26 І нічога не сказаў Саўл у той дзень, бо ён сказаў: «Можа, што здарылася. Хіба ён нячысты,
бо не ачысьціўся».
27 Але назаўтра, на другі дзень маладзіка, заўважылі, што месца Давіда зноў пустое, і сказаў
Саўл Ёнатану, сыну свайму: «Чаму сын Есэя не прыйшоў на банкет ані ўчора, ані сёньня?»
28 І адказаў Ёнатан Саўлу: «Давід вельмі прасіў мяне [адпусьціць] яго ў Бэтлеем.
29 Ён казаў: “Адпусьці мяне, бо сям'я мая ў горадзе складае ахвяру, і брат мой запрасіў мяне,
і калі я знайшоў ласку ў вачах тваіх, я пайду і наведаю братоў маіх”. З гэтай прычыны не
прыйшоў ён на банкет валадара».
30 І ўзлаваўся Саўл на Ёнатана, і сказаў яму: «Ты, сын жанчыны здрадлівай, ці ж я ня ведаю,
што ты любіш сына Есэя на ганьбу тваю і на ганьбу маці тваёй.
31 Як доўга будуць дні жыцьця на зямлі сына Есэя, ня будзеш у бясьпецы ані ты, ані
валадараньне тваё. Дык цяпер пашлі і прывядзі яго да мяне, бо ён павінен памерці».
32 І адказаў Ёнатан Саўлу, бацьку свайму, і сказаў яму: «Чаму ён мусіць памерці? Што ён
зрабіў?»
33 І кінуў Саўл у яго дзіду, каб забіць яго, і зразумеў Ёнатан, што бацька ягоны вырашыў забіць
Давіда.
34 І падняўся Ёнатан ад стала поўны гневу, і ня еў хлеба ў другі дзень маладзіка, бо трывожыўся
дзеля Давіда, і што бацька ягоны зьняважыў [таксама] яго.
35 І сталася раніцаю, пайшоў Ёнатан у поле, на месца, вызначанае Давідам, а разам з ім юнак.
36 І сказаў ён юнаку свайму: «Бяжы і знайдзі стрэлы, якія я пушчу». І калі юнак пабег, ён
пусьціў стралу цераз юнака.
37 І пайшоў юнак да месца стралы, якую пусьціў Ёнатан, а Ёнатан крыкнуў за ім і сказаў:
«Страла далей за табою».
38 І закрычаў Ёнатан ззаду за юнаком: «Падымі хутчэй, ня стой там!» І сабраў юнак стрэлы
Ёнатана, і прыйшоў да гаспадара свайго.
39 І не разумеў юнак анічога. Толькі Ёнатан і Давід разумелі справу.
40 І аддаў Ёнатан зброю сваю юнаку, і сказаў яму: «Ідзі і занясі ў горад».

41 І калі пайшоў юнак, устаў Давід з паўднёвага боку, і ўпаў абліччам сваім на зямлю, і тры
разы пакланіўся. І пацалавалі яны адзін аднаго, і плакалі абодва разам, а Давід плакаў уголас.
42 І сказаў Ёнатан Давіду: «Ідзі ў супакоі, бо мы прысягнулі абодва ў імя ГОСПАДА, кажучы:
“ГОСПАД будзе між мною і табой, і паміж насеньнем маім і насеньнем тваім на вякі”».

1 Сам 21

1 І Давід устаў, і пайшоў, а Ёнатан пайшоў у горад.
2 І пайшоў Давід у Ноб, да сьвятара Ахімэлеха. А Ахімэлех выйшаў насустрач Давіду і сказаў
яму: «Чаму ты толькі адзін, і нікога няма з табой?»
3 І сказаў Давід сьвятару Ахімэлеху: «Валадар загадаў мне [зрабіць] справу і сказаў: “Няхай
ніхто ня ведае нічога пра справу, з якой я цябе пасылаю, і што я табе загадаў”. І я пакінуў
юнакоў у вызначаным месцы.
4 І цяпер, калі маеш у руцэ тваёй пяць хлябоў, дай у руку маю іх або тое, што знойдзеш».
5 І адказаў Давіду сьвятар, і сказаў: «Звычайнага хлеба ня маю, каб даць у руку тваю, а ёсьць
толькі хлеб сьвяты. Ці чыстыя юнакі твае хаця б адносна жанчынаў?»
6 І адказаў Давід сьвятару, і сказаў яму: «Жанчынаў не было з намі ані ўчора, ані пазаўчора,
і калі выходзілі ў дарогу, і целы юнакоў сьвятыя, хоць гэтая выправа звычайная. Тым больш
сёньня асьвячоныя целы іхнія».
7 І даў яму сьвятар [хлеб] сьвяты, бо не было там [іншага] хлеба, апрача хлябоў пакладных,
якія прымалі спрад аблічча ГОСПАДА толькі тады, калі клалі там сьвежыя хлябы.
8 І быў там адзін слуга Саўла, які ў той дзень затрымаўся перад абліччам ГОСПАДА. Ён
называўся Даэг Эдомец, начальнік пастухоў Саўла.
9 І сказаў Давід Ахімэлеху: «Ці ня маеш тут пад рукой дзіду або меч? Бо мяча свайго і зброі
сваёй я ня ўзяў у руку сваю, бо справа валадара была пільная».
10 І сказаў сьвятар: «Тут меч Галіята, Філістынца, якога ты забіў у лагчыне Эла. Вось, ён
закручаны ў плашч і [ляжыць] пад эфодам. Калі хочаш яго ўзяць, бяры, бо апрача яго няма
тут іншага». І сказаў Давід: «Калі няма іншага такога, дай яго мне».
11 І ўстаў Давід, і ў той дзень уцёк ад Саўла, і прыйшоў да Ахіша, валадара Гату.
12 І сказалі слугі Ахіша яму: «Ці ж гэта не Давід, валадар той зямлі? Ці ж не яму сьпявалі
карагоды, кажучы: “Саўл пабіў тысячы, а Давід — дзясяткі тысячаў”?»
13 І Давід узяў да сэрца свайго словы гэтыя, і вельмі баяўся Ахіша, валадара Гату.
14 І зьмяніў ён паводзіны свае ў вачах іхніх, і ўдаваў вар’ята ў руках іхніх, і біў у брамы іхнія, і
сьліна ягоная сьцякала на бараду ягоную.
15 І Ахіш сказаў слугам сваім: «Ці ж ня бачыце, што ён — вар’ят. Навошта вы прывялі яго да
мяне?
16 Ці ж не хапае нам вар’ятаў, што вы прывялі гэтага, каб ён вар’яцеў перада мною? Ці ж такога
трэба ўводзіць у дом мой?»

1 Сам 22

1 І пайшоў Давід адтуль, і ўцёк у пячору Адулям. І пачулі [пра гэта] браты ягоныя і ўвесь дом
бацькі ягонага, і ўсе пайшлі за ім туды.
2 І сабраліся да яго ўсе пакрыўджаныя, і тыя, што мелі даўгі, і засмучаныя ў духу, і ён стаўся
іх правадыром. І было з ім каля чатырох сотняў чалавек.
3 Адтуль пайшоў Давід у Міцпу, якая ў Мааве, і сказаў валадару Мааву: «Дазволь жыць у вас
бацьку майму і маці маёй, пакуль выявіцца, што Бог зробіць са мною».
4 І ён прывёў іх перад аблічча валадара Мааву, і яны заставаліся ў яго ўсе дні, калі Давід хаваўся
ва ўмацаваным месцы.
5 І сказаў прарок Гад Давіду: «Не заставайся ва ўмацаваным месцы, але зьбярыся і ідзі ў зямлю
Юды». І вырушыў Давід, і прыйшоў у лес Хэрэт.
6 І пачуў Саўл, што заўважаны Давід і людзі, якія з ім. А Саўл сядзеў тады ў Гіве пад тамарыскам
на ўзгорку, і дзіда была ў руцэ ягонай, а ўсе слугі ягоныя атачалі яго.

7 І сказаў Саўл слугам сваім, што былі з ім: «Слухайце, сыны Бэн'яміна! Ці ж сын Есэя дасьць
вам усім палі і вінаграднікі? Ці ж вас усіх ён зробіць тысячнікамі і сотнікамі,
8 што вы запрысягліся супраць мяне. Ніхто не паведаміў у вушы мае пра запавет сына майго
з сынам Есэя. Ніхто з вас не спачуваў мне і не паведаміў у вушы мае, што сын мой узбудзіў
слугу майго супраць мяне, каб ён зрабіў засаду на мяне як гэта [дзеецца] сёньня».
9 І адказаў Даэг Эдомец, які стаяў між слугамі Саўла, і сказаў: «Я бачыў сына Есэя ў Нобе ў
Ахімэлеха, сына Ахітува.
10 І ён пытаўся ў ГОСПАДА дзеля яго, і даў яму ежу, і даў яму меч Галіята Філістынца».
11 І паслаў валадар, каб паклікалі сьвятара Ахімэлеха, сына Ахітува, і ўвесь дом бацькі ягонага,
сьвятароў, якія ў Нобе. І ўсе яны прыйшлі да валадара.
12 І сказаў Саўл: «Слухай, сыне Ахітува!» Ён сказаў: «Вось я, гаспадару мой».
13 І сказаў яму Саўл: «Чаму запрысягліся вы супраць мяне, ты і сын Есэя, і даў ты яму хлябы і
меч, і пытаўся дзеля яго ў Бога, каб ён паўстаў супраць мяне, як гэта [дзеецца] сёньня?»
14 І адказаў валадару Ахімэлех, і сказаў: «Хто спасярод слугаў тваіх ёсьць так верны як Давід,
зяць валадара? Ён стаіць на чале варты тваёй і шанаваны ў доме тваім.
15 Ці ж толькі сёньня я пытаўся дзеля яго ў Бога? Ніякім чынам! Няхай валадар не закідвае
ў гэтай справе слузе твайму і ўсяму дому бацькі майго, бо слуга твой нічога ня ведае ў гэтай
справе, ані малога, ані вялікага».
16 І сказаў валадар: «Ты сьмерцю памрэш, Ахімэлех, ты і ўвесь дом бацькі твайго».
17 І загадаў валадар слугам, якія атачалі яго: «Ідзіце і забіце сьвятароў ГОСПАДА, бо рука іхняя
з Давідам, бо яны ведалі, што ён уцякае, і не паведамілі ў вушы мае». Але слугі валадара не
хацелі падняць рукі сваёй на сьвятароў ГОСПАДА.
18 І сказаў валадар Даэгу: «Ты ідзі і забі сьвятароў». І Даэг Эдомец падыйшоў да сьвятароў, і
забіў у той дзень восемдзясят пяць чалавек, апранутых у ільняны эфод.
19 І напаў Саўл на сьвятарскі горад Ноб, і вострывам мяча пазабіваў мужчынаў і жанчынаў,
дзяцей і немаўлят, валоў, аслоў і авечак.
20 І ўратаваўся [толькі] адзін сын Ахімэлеха, сына Ахітува, на імя Абіятар, і ён уцёк да Давіда.
21 І Абіятар паведаміў Давіду, што Саўл забіў сьвятароў ГОСПАДА.
22 І сказаў Давід Абіятару: «Я ведаў у той дзень, калі быў там Даэг Эдомец, што ён паведаміць
пра гэта Саўлу. Я вінаваты ў-ва ўсіх душах дому бацькі твайго.
23 Заставайся са мною, ня бойся! Хто шукае душы маёй, той шукае душы тваёй, але са мною
ты будзеш выратаваны».

1 Сам 23

1 І паведамілі Давіду, кажучы: «Вось, Філістынцы напалі на Кейлю і рабуюць гумны».
2 І пытаўся Давід у ГОСПАДА, кажучы: «Ці ісьці і ўдарыць на Філістынцаў гэтых?» І сказаў
ГОСПАД Давіду: «Ідзі, і нападзі на Філістынцаў гэтых, і вызвалі Кейлю».
3 І сказалі людзі Давіда яму: «Вось, мы тут у Юдэі жывем у страху, і мы пойдзем у Кейлю на
дружыны Філістынскія?»
4 І Давід зноў пытаўся ў ГОСПАДА, і ГОСПАД адказаў яму, і сказаў: «Уставай і ідзі ў Кейлю, бо
Я аддам Філістынцаў у рукі твае».
5 І пайшоў Давід і людзі ягоныя ў Кейлю, і ваявалі супраць Філістынцаў, і забралі жывёлу
іхнюю, і ўчынілі ім вялікую паразу, і вызваліў Давід жыхароў Кейлі.
6 І было, што Абіятар, сын Ахімэлеха, уцёк да Давіда ў Кейлю, і ён зыйшоў з эфодам у руцэ
сваёй.
7 І паведамілі Саўлу, што Давід прыйшоў у Кейлю, і сказаў Саўл: «Аддаў яго Бог у рукі мае, бо
ўваходзячы ў горад, які мае брамы і запоры, ён сам замкнуў сябе».
8 І склікаў Саўл увесь народ на вайну, каб ісьці ў Кейлю і аблягаць Давіда і людзей ягоных.
9 І даведаўся Давід, што Саўл патаемна рыхтуе яму зло, і сказаў Абіятару сьвятару: «Прынясі
эфод».

10 І сказаў Давід: «ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, слуга твой, чуючы, пачуў, што Саўл мае намер прыйсьці ў Кейлю, каб зруйнаваць горад з маёй прычыны.
11 Ці аддадуць мяне гаспадары Кейлі ў рукі ягоныя? Ці прыйдзе Саўл, як чуў слуга твой? ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, адкажы слузе твайму». І сказаў ГОСПАД: «Прыйдзе».
12 І спытаўся Давід: «Ці выдадуць мяне і людзей маіх гаспадары Кейлі ў рукі Саўла?» ГОСПАД сказаў: «Выдадуць».
13 І ўстаў Давід і людзі ягоныя лікам каля шасьцісот, і выйшлі з Кейлі, і хадзілі, дзе маглі. І паведамілі Саўлу, што Давід уцёк з Кейлі, і ён адклікаў выправу.
14 І быў Давід у пустыні ў недасяжных месцах, і пасяліўся ў гарах у пустыні Зіф. А Саўл шукаў яго ўсе дні, але Бог ня выдаў [Давіда] ў рукі ягоныя.
15 І ўбачыў Давід, што Саўл вырушыў і шукае душу ягоную, а ён быў у пустыні Зіф у Харэшы.
16 І ўстаў Ёнатан, сын Саўла, і прыйшоў да Давіда ў Харэш, і ўмацаваў яго ў Богу,
17 і сказаў яму: «Ня бойся, ня знойдзе цябе рука Саўла, бацькі майго, і ты будзеш валадарыць над Ізраілем, а я буду другім пасьля цябе. І вось, Саўл, бацька мой, ведае гэта».
18 І абодва яны заключылі запавет перад абліччам ГОСПАДА. І Давід застаўся ў Харэшы, а Ёнатан вярнуўся ў дом свой.
19 І пайшлі Зіфейцы да Саўла ў Гіву, кажучы: «Давід хаваецца каля нас у недасяжных месцах у Харэшы, на ўзгорышчы Хахіля, на поўдні пусткі.
20 І цяпер, валадару, калі душа твая пажадае, зыходзячы, зыходзь, а мы выдадзім яго ў рукі валадара».
21 І сказаў Саўл: «Няхай дабраславіць вас ГОСПАД, бо вы спачуваеце мне.
22 Ідзіце і праверце ўсё яшчэ раз, і даведайцеся, і агледзьце месца, у якім стопы ягоныя, і хто яго там бачыў. Бо казалі мне, што ён вельмі хітры.
23 І пабачце, і выведайце ўсе сховы ягоныя, у якіх ён хаваецца, і вярніцеся да мяне, ведаючы месца, і я пайду з вамі. І калі ён будзе ў зямлі гэтай, я буду шукаць яго ў-ва ўсіх тысячах Юды».
24 І яны ўсталі і пайшлі ў Зіф перад абліччам Саўла. А Давід і людзі ягоныя былі ў пустыні Маон, у Арабе на поўдні пусткі.
25 І пайшоў Саўл з людзьмі сваімі шукаць [Давіда]. І паведамілі Давіду [пра гэта], і ён зыйшоў са скалы, і застаўся ў пустыні Маон. А Саўл пачуў [пра гэта] і гнаўся за Давідам у пустыні Маон.
26 І ішоў Саўл па адным баку гары, а Давід з людзьмі сваімі былі на другім баку гары. І Давід пасьпешліва ўцякаў ад аблічча Саўлам, а Саўл з людзьмі сваімі [намагаўся] атачыць Давіда і людзей ягоных, каб злавіць іх.
27 І прыйшоў пасланец да Саўла, кажучы: «Сьпяшайся вярнуцца, бо Філістынцы напалі на зямлю».
28 І Саўл вярнуўся з пагоні за Давідам, і выйшаў супраць Філістынцаў. Дзеля таго назвалі месца тое Сэля-Гаммахлекот.

1 Сам 24

1 І пайшоў Давід адтуль, і абжыўся ў месцах умацаваных у Эн-Гэдзі.
2 І калі вярнуўся Саўл з вайны з Філістынцамі, паведамілі яму, кажучы: «Вось, Давід у пустыні Эн-Гэдзі».
3 І Саўл узяў тры тысячы ваяроў, выбранцоў з усяго Ізраіля, і пайшоў, каб шукаць Давіда і людзей ягоных на ўсходнім баку скалаў Дзікіх Козаў.
4 І прыйшоў ён да загарадак авечых пры дарозе, і была там пячора. І ўвайшоў Саўл туды, каб накрыць ногі свае, а Давід і людзі ягоныя хаваліся ў пячоры.
5 І сказалі Давіду людзі ягоныя: «Вось дзень, пра які казаў табе ГОСПАД: “Вось, Я даю ў рукі твае ворага твайго і зробіш з ім тое, што добра ў вачах тваіх”». І ўстаў Давід, і адрэзаў цішком крысо плашча Саўла.
6 Але потым задрыжэла сэрца Давіда, што ён адрэзаў крысо плашча Саўла,
7 і ён сказаў людзям сваім: «Няхай даруе мне ГОСПАД, каб я зрабіў такую рэч гаспадару майму, памазанцу ГОСПАДАВУ, каб выцягнуў руку маю на яго, бо ён — памазанец ГОСПАДАЎ».

8 І стрымаў Давід людзей сваіх гэтымі словамі, і ня даў ім, каб яны напалі на Саўла. А Саўл
устаў, і выйшаў з пячоры, і працягваў шлях свой.
9 І ўстаў пасьля гэтага Давід, і выйшаў з пячоры, і закрычаў ззаду за Саўлам, кажучы:
«Гаспадару мой, валадар!» І глянуў Саўл назад, а Давід упаў аблічам на зямлю і пакланіўся
яму,
10 І сказаў Давід Саўлу: «Навошта ты слухаеш словы людзей, якія кажуць: “Давід шукае зла
для цябе”?
11 Вось, сёньня бачаць вочы твае, што ГОСПАД выдаў цябе ў пячоры ў рукі мае. І гаварылі мне,
каб я забіў цябе, але я пашкадаваў цябе, і сказаў: “Ня выцягну рукі маёй на гаспадара майго,
бо ён — памазанец ГОСПАДАЎ”.
12 Дык пабач, бацька мой, крысо плашча твайго ў руцэ маёй, бо я адрэзаў крысо плашча твайго
і не забіў цябе. І даведайся, і пабач, што няма ў руцэ маёй ані зла, ані бунту, і не саграшыў я
супраць цябе. А ты шукаеш душы маёй, каб забраць яе.
13 Няхай судзіць ГОСПАД мяне і цябе, і няхай адпомсьціць ГОСПАД табе за мяне, але ня будзе
рукі маёй супраць цябе.
14 Як кажа прыказка старадаўняя: “Ад ліхіх ліха паходзіць”. Але рука мая ня будзе супраць
цябе.
15 Каго гоніць валадар Ізраіля? Каго ты перасьледуеш? Сабаку здохлага і адну блыху?
16 Няхай ГОСПАД будзе судзьдзёю і судзіць мяне і цябе. Няхай убачыць і разьбярэ справу маю?
і вырве мяне з рукі тваёй».
17 І скончыў Давід казаць словы гэтыя да Саўла, і Саўл сказаў: «Ці ж гэта голас твой, сыне мой
Давід?» І ўзьняў Саўл голас свой, і заплакаў.
18 І сказаў ён Давіду: «Ты больш праведны, чым я. Бо ты адплочваеш мне дабром, а я
адплочваю табе ліхам.
19 І ты засьведчыў сёньня, што ты робіш дабро да мяне, бо калі ГОСПАД выдаў мяне ў рукі твае,
ты не забіў мяне.
20 Бо хто, спаткаўшы ворага свайго, пусьціў бы яго ў добрую дарогу? Няхай ГОСПАД
узнагародзіць цябе дабром за тое, што ты сёньня зрабіў адносна мяне.
21 Вось, я цяпер ведаю, што ты будзеш валадаром, і будзеш мець у руках сваіх валадарства
Ізраіля.
22 І цяпер прысягні мне на ГОСПАДА, што ня зьнішчыш насеньне маё пасьля мяне і не сатрэш
імя майго з дому бацькі майго».
23 І Давід прысягнуў Саўлу. І вярнуўся Саўл у дом свой, а Давід і людзі ягоныя пайшлі ў месца
ўмацаванае.

1 Сам 25

1 І памёр Самуэль, і сабраўся ўвесь Ізраіль, і плакалі па ім, і пахавалі яго ў доме ягоным у Раме.
А Давід устаў і пайшоў у пустыню Паран.
2 І быў [нейкі] чалавек у Маоне, які меў паселасьць сваю ў Кармэлю, і быў той чалавек вельмі
багаты. Было ў яго авечак тры тысячы і тысяча козаў. І сталася, што ён стрыг авечак сваіх у
Кармэлю.
3 Імя таго чалавека было Наваль, а імя жонкі ягонай — Абігайль. Жанчына тая была разумная
і прыгожая, а муж ейны быў жорсткі і злачынны, ён [быў] з роду Халева.
4 І пачуў Давід у пустыні, што Наваль стрыжэ авечак сваіх.
5 І паслаў Давід дзесяць юнакоў, і сказаў Давід юнакам: «Ідзіце ў Кармэль і зайдзіце да Наваля,
і прывітайце яго ад мяне з мірам,
6 і скажыце яму: “Здароўя і супакою табе, і супакой дому твайму, і ўсяму, што ты маеш, няхай
будзе супакой!
7 Пачуў я, што стрыгуць авечак у цябе. Пастухі твае былі разам з намі, і мы ня крыўдзілі іх, і
нічога не прапала ў іх за ўсе дні, калі былі яны з намі ў Кармэлю.

8 Спытайся ў слугаў сваіх, і яны паведамяць табе. Дык няхай юнакі гэтыя знойдуць ласку ў
вачах тваіх, бо ў добры дзень мы прыходзім. Што знойдзе рука твая, дай слугам тваім і сыну
твайму Давіду”».
9 І прыйшлі юнакі Давіда, і сказалі Навалю ўсе словы ад імя Давіда, і маўчалі.
10 І адказаў Наваль юнакам Давіда, і сказаў: «Хто такі Давід і хто сын Есэя? Сёньня
намножылася слугаў, якія пакідаюць гаспадароў сваіх.
11 Дык я што, маю ўзяць хлеб мой, ваду маю і мяса, прыгатаванае для стрыгачоў, і даць іх
людзям, пра якіх ня ведаю, адкуль яны?»
12 І павярнуліся юнакі Давіда ў дарогу [адваротную], і прыйшлі, і паведамілі ўсе словы гэтыя
[Давіду].
13 І сказаў Давід людзям сваім: «Няхай кожны падпярэжацца мячом сваім!» І падперазаўся
кожны мячом сваім, і таксама Давід падперазаўся мячом сваім, і вырушылі з Давідам каля
чатырохсот чалавек, а дзьвесьце засталіся ў табары.
14 І адзін са слугаў [Наваля] паведаміў Абігайлі, жонцы Наваля, кажучы: «Вось, Давід прыслаў
пасланцоў з пустыні, каб прывіталі гаспадара нашага, а ён дрэнна абыйшоўся з імі.
15 А людзі тыя былі для нас добрымі і ня крыўдзілі нас. І нічога не загінула ў нас у-ва ўсе дні,
у якія мы з імі хадзілі ў полі.
16 Былі яны нам мурам [ахоўным] як уначы, так і ўдзень у-ва ўсе дні, калі мы хадзілі з імі і
пасьвілі авечак.
17 І цяпер разваж і пабач, што зрабіць, бо ліхая пастанова прынятая супраць гаспадара нашага
і супраць усяго дому ягонага, а ён — сын Бэліяла, і з ім нельга дамовіцца».
18 І Абігайль узяла пасьпешліва дзьвесьце хлябоў, два буклакі віна, пяць запечаных авечак,
пяць мерак пражаных зярнят, сто [мерак] разынак і дзьвесьце [зьвязак] сушаных фігаў, і
наладавала на аслоў.
19 І сказала яна слугам сваім: «Вы ідзіце наперадзе, а я вось буду ісьці за вамі». А мужу свайму
Навалю не сказала нічога.
20 І калі яна, седзячы на асьле, зыходзіла па схіле з гары, вось, Давід і людзі ягоныя ішлі
насустрач ёй, і яна спаткала іх.
21 А Давід казаў [сабе]: «Надарма я захоўваў у пустыні ўсю маёмасьць чалавека гэтага і нішто
не прапала з таго, што да яго [належала], бо ён адплаціў мне ліхам за дабро.
22 Няхай гэта зробіць Бог з ворагамі Давіда і тое дадасьць, калі я да раніцы пакіну з усяго, што
яму [належыць], [хоць аднаго], хто мочыцца на сьцяну».
23 І ўбачыла Абігайль Давіда, і пасьпешліва зьлезла з асла, і ўпала на аблічча сваё перад
Давідам, і пакланілася яму да зямлі.
24 І кінулася яна да ног ягоных, і сказала: «Гаспадару мой, мая гэта віна. Дазволь служцы
тваёй гаварыць у вушы твае, і выслухай словы служкі тваёй.
25 Няхай гаспадар мой не бярэ да сэрца свайго чалавека гэтага, [сына] Бэліяла, Наваля, бо ён
такі, якое імя ягонае. Наваль імя ягонае, і такая ж дурасьць у ім. А я, служка твая, ня бачыла
юнакоў гаспадара майго, якіх ты паслаў.
26 І цяпер, гаспадару мой, як жывы ГОСПАД і як жывая душа твая, ГОСПАД устрымаў цябе
ад праліцьця крыві і помсты на сваю руку, і цяпер ворагі твае і ўсе, што шукаюць няшчасьця
гаспадару майму, падобнымі няхай стануцца да Наваля.
27 І цяпер прыймі дабраславенства гэтае, якое прынесла служка твая гаспадару свайму, і дай
яго юнакам сваім, якія ходзяць разам з гаспадаром маім.
28 І даруй віну служкі тваёй. А ГОСПАД збудуе гаспадару майму дом, які будзе трываць, бо
гаспадар мой вядзе войны ГОСПАДА, і няхай не сустрэне цябе няшчасьце ў-ва [ўсе] дні твае.
29 Калі паўстане чалавек, каб перасьледаваць цябе і шукаць душы тваёй, няхай душа гаспадара
майго будзе захаваная ў вузьле жыцьця ў ГОСПАДА, Бога твайго, а душу ворагаў тваіх няхай
выкіне Ён, як з пушчалкі.
30 І калі зробіць ГОСПАД гаспадару майму ўсё добрае, што абяцаў, і паставіць цябе правадыром
Ізраіля,

31 няхай ня будзе сэрцу гаспадара майго згрызотай і непакоем, што ты праліў кроў нявінную
і не захаваў сябе ад помсты. І калі ГОСПАД учыніць дабро гаспадару майму, ты ўзгадаеш тады
пра служку тваю».
32 І сказаў Давід Абігайлі: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які паслаў цябе сёньня на
сустрэчу са мной.
33 І няхай будзе дабраслаўлёна разумнасьць твая, і дабраслаўлёна таксама ты, бо стрымала ты
мяне сёньня ад праліцьця крыві і ад помсты рукою маёй.
34 Бо іначай, як жывы ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які стрымаў мяне, каб я не зрабіў табе зла, калі б
ты ня выйшла пасьпешліва на спатканьне мне, не засталося б у Наваля да сьвітаньня нікога з
тых, хто мочыцца на сьцяну».
35 І ўзяў Давід з рук ейных усё, што яна прынесла, і сказаў ёй: «Ідзі ў супакоі ў дом твой, бо я
выслухаў голас твой і ўшанаваў аблічча тваё».
36 І вярнулася Абігайль да Наваля, і вось, ён справіў банкет у доме сваім як банкет валадарскі.
І сэрца Наваля было вясёлае, і быў ён вельмі п'яны. І яна не сказала яму анічога пра гэта ані
малога, ані вялікага да сьвітаньня раніцы.
37 Раніцаю, калі Наваль працьверазіўся ад віна, жонка ягоная распавяла яму пра справу гэтую.
І замерла сэрца ягонае ў нутры ягоным, і ён зрабіўся як камень.
38 І праз дзесяць дзён ГОСПАД ударыў Наваля, і ён памёр.
39 І пачуў Давід, што Наваль памёр, і сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Які рассудзіў справу
зьнявагі маёй з боку Наваля і захаваў слугу Свайго ад зла, а злачыннасьць Наваля зьвярнуў
ГОСПАД на галаву ягоную». І паслаў Давід сказаць Абігайлі, што ён бярэ яе сабе за жонку.
40 І прыйшлі слугі Давіда да Абігайлі ў Кармэль, і прамовілі да яе, кажучы: «Давід паслаў нас
да цябе, каб узяць цябе сабе за жонку».
41 І яна ўстала, і пакланілася абліччам да зямлі, і сказала: «Вось, служка твая — нявольніца,
каб мыць ногі слугаў гаспадара майго».
42 І ўстала пасьпешліва Абігайль, і села на асла, і пяць служак ейных ішлі за ёю. І паехала яна
за пасланцамі Давіда, і сталася жонкаю ягонаю.
43 Таксама Ахіноам з Езрээлю ўзяў Давід за жонку, і яны абедзьве сталіся жонкамі ягонымі.
44 А Саўл аддаў Міхаль, дачку сваю, жонку Давіда, Пальту, сыну Ляіша, які [паходзіў] з Галіму.

1 Сам 26

1 І прыйшлі Зіфейцы ў Гіву да Саўла, кажучы: «Ведай, Давід хаваецца на ўзгорышчы Хахіля,
што на канцы пусткі».
2 І ўстаў Саўл, і вырушыў у пустыню Зіф, а з ім тры тысячы мужчынаў, выбранцоў Ізраіля, каб
шукаць Давіда ў пустыні Зіф.
3 І разлажыўся табарам Саўл на ўзгорышчы Хахіля, на скраю пусткі каля дарогі. А Давід
знаходзіўся ў пустыні, і ўбачыў, што выйшаў Саўл за ім у пустыню.
4 І паслаў Давід выведчыкаў, і ўпэўніўся, што Саўл сапраўды прыйшоў.
5 І ўстаў Давід, і прыйшоў да месца, дзе быў Саўл. І ўбачыў Давід месца, дзе спаў Саўл і Абнэр,
сын Нэра, начальнік войска ягонага. А Саўл спаў у будане, і народ разлажыўся табарам вакол
яго.
6 І адказаў Давід, і сказаў Ахімэлеху Хету і Абішаю, сыну Цэруі, брату Ёава, кажучы: «Хто
пойдзе са мною ў табар да Саўла?» І сказаў Абішай: «Я пайду з табой».
7 І пайшлі Давід і Абішай цішком уначы да людзей [Саўла], і вось, Саўл ляжыць і сьпіць у будане,
і дзіда ягоная ўбітая ў зямлю каля галавы ягонай, а Абнэр і народ сьпяць вакол яго.
8 І сказаў Абішай Давіду: «Сёньня Бог аддае ворага твайго ў рукі твае. Цяпер дазволь, і я прыб'ю
яго дзідаю да зямлі раз, і другі ўжо раз ня будзе патрэбы».
9 І сказаў Давід Абішаю: «Не забівай яго, бо ці ж можа быць невінаваты той, хто падняў руку
сваю на памазанца ГОСПАДАВАГА?»
10 І сказаў Давід: «Як жывы ГОСПАД, ГОСПАД пакарае яго, або прыйдзе дзень ягоны і ён памрэ,
або ён загіне, пайшоўшы на вайну.

11 Няхай захавае мяне ГОСПАД, каб я падняў руку сваю на памазанца ГОСПАДАВАГА. А цяпер
вазьмі дзіду, што каля галавы ягонай і гляк з вадою, і пойдзем».
12 І ўзяў Давід дзіду і гляк з вадою, якія былі каля галавы Саўла, і яны пайшлі. І ніхто іх ня
бачыў, і ніхто ня ведаў, і ніхто не прачнуўся, бо ўсе спалі покатам, бо сон ад ГОСПАДА зыйшоў
на іх.
13 І перайшоў Давід на другі бок, і стаў на вяршыні гары здалёк, і быў вялікі прастор між імі.
14 І закрычаў Давід да людзей [Саўла] і да Абнэра, сына Нэра, кажучы: «Абнэр, чаму не
адказваеш?» І адказаў Абнэр, і сказаў: «Хто ты? Чаму ты клічаш валадара?»
15 І сказаў Давід Абнэру: «Ці ты не мужчына? І хто зраўняецца з табой у Ізраілі? Дык чаму
ты не пільнаваў гаспадара свайго, валадара? Бо нехта з народу ўваходзіў, каб забіць валадара,
гаспадара твайго.
16 Нядобра тое, што ты зрабіў. Як жывы ГОСПАД! Заслужыліся вы на сьмерць, бо не пільнавалі
гаспадара свайго, памазанца ГОСПАДАВАГА. І цяпер паглядзі, дзе дзіда валадара і дзе гляк з
вадою, што стаяў каля галавы ягонай?»
17 І пазнаў Саўл голас Давіда, і сказаў: «Ці гэта голас твой, сыне мой Давід?» І Давід сказаў:
«Гэта голас мой, гаспадару мой, валадар».
18 І сказаў: «Чаму гаспадар мой перасьледуе слугу свайго? Што я зрабіў? Ці ёсьць што ліхое ў
руцэ маёй?
19 І цяпер няхай паслухае гаспадар мой, валадар, словы слугі свайго. Калі ГОСПАД намовіў
цябе супраць мяне, няхай будзе Яму прыемны пах ахвяры. Але калі сыны чалавечыя [намовілі
цябе], няхай будуць яны праклятыя перад абліччам ГОСПАДА, бо яны выгналі мяне сёньня, каб
я ня меў часткі ў спадчыне ГОСПАДА, кажучы: “Ідзі і служы багам чужым”.
20 І цяпер няхай кроў мая ня будзе вылітая на зямлю далёка ад ГОСПАДА. Бо валадар Ізраіля
выйшаў, каб шукаць адну блыху, як палююць у гарах на курапатку».
21 І сказаў Саўл: «Саграшыў я. Вярніся, сыне мой Давід, бо ўжо ніколі больш не зраблю табе
крыўды, за тое, што дарагая была сёньня ў вачах тваіх душа мая. Вось, я быў неразумны, шмат
разоў памыляўся».
22 І адказаў яму Давід, і сказаў: «Вось дзіда валадара. Няхай пяройдзе хто з юнакоў і возьме
яе.
23 А ГОСПАД аднагародзіць кожнаму паводле праведнасьці ягонай і вернасьці ягонай.
Аддаў цябе сёньня ГОСПАД у рукі мае, але я не хацеў выцягнуць рукі маёй на памазанца
ГОСПАДАВАГА.
24 І як каштоўнай была душа твая ў вачах маіх, так няхай каштоўнай будзе душа мая ў вачах
ГОСПАДА, і няхай абароніць Ён мяне ад усякага прыгнёту».
25 І сказаў Саўл Давіду: «Дабраслаўлёны ты, сыне мой Давід, бо ўсё, што будзеш рабіць, зробіш,
і будзеш мець посьпех». І Давід пайшоў дарогай сваёй, а Саўл вярнуўся на месца сваё.

1 Сам 27

1 І сказаў Давід у сэрцы сваім: «У нейкі дзень я загіну ад рукі Саўла. Ці ня лепш мне схавацца
ў зямлі Філістынцаў, каб кінуў Саўл шукаць мяне ў-ва ўсіх межах Ізраіля, і я ўхілюся ад рук
ягоных».
2 І ўстаў Давід, і пайшоў ён і шэсьцьсот чалавек, якія з ім, да Ахіша, сына Маоха, валадара Гату.
3 І жыў Давід у Ахіша ў Гаце, ён і людзі ягоныя, кожны з домам сваім, Давід з дзьвюма жонкамі
сваімі, Ахіноам з Езрээлю і Абігайль, жонкай Наваля з Кармэлю.
4 І паведамілі Саўлу, што Давід уцёк у Гат, і ён кінуў шукаць яго.
5 І сказаў Давід Ахішу: «Калі я маю ласку ў вачах тваіх, дай мне месца ў адным з гарадоў зямлі
гэтай, каб я мог жыць там. Навошта слуга твой мае жыць з табою ў горадзе валадара?»
6 І даў яму Ахіш у той дзень Цыкляг, і таму Цыкляг [стаўся] горадам валадароў Юдэйскіх аж
да гэтага дня.
7 І быў лік дзён, калі Давід жыў у зямлі Філістынцаў, год і чатыры месяцы.
8 І выходзіў Давід з людзьмі сваімі, і нападаў на Гешурцаў, на Гізрэяў і на Амалека, бо гэтыя
народы жылі на зямлі пры дарозе на Шур і аж да зямлі Эгіпецкай.

9 І пустошыў Давід тую зямлю, не пакідаючы жывымі ані мужчыны, ані жанчыны, і забіраў
авечак, валоў, аслоў, вярблюдаў і адзеньне, і вяртаўся, і прыходзіў да Ахіша.
10 І казаў Ахіш: «На каго нападалі вы сёньня?» А Давід казаў: «На Нэгеў Юдэйскі і на Нэгеў
Ерхамээля, і на Нэгеў Кенэйскі».
11 Ані мужчыны, ані жанчыны не пакідаў пры жыцьці Давід, каб прыводзіць іх у Гат, бо казаў
ён: «Каб не паведамілі пра нас, кажучы: “Гэта зрабіў Давід”». І гэткія былі справы ягоныя ў-ва
ўсе дні, калі ён жыў у краіне Філістынцаў.
12 І давяраў Ахіш Давіду, кажучы: «Стаўся ён зьненавіджаны ў народзе сваім, Ізраілі, і будзе
ён мне слугою вечна».

1 Сам 28

1 У тыя дні сабралі Філістынцы дружыны свае, каб ваяваць супраць Ізраіля. І Ахіш сказаў
Давіду: «Ведай, што ты пойдзеш са мною ў табар, ты і людзі твае».
2 І сказаў Давід Ахішу: «Цяпер і ты даведаешся, што робіць слуга твой». І сказаў Ахіш Давіду:
«Стаўлю цябе ахоўнікам галавы маёй на ўсе дні».
3 А Самуэль памёр, і плакаў па ім увесь Ізраіль, і пахавалі яго ў горадзе ягоным, у Раме. А Саўл
прагнаў тых, што выклікаюць духаў [памерлых], і варажбітоў з зямлі [Ізраіля].
4 І Філістынцы сабраліся, і прыйшлі, і разлажыліся табарам у Шунэме. А Саўл сабраў усяго
Ізраіля і разлажыўся табарам у Гільбоа.
5 І паглядзеў Саўл на табар Філістынцаў, і спалохаўся, і моцна задрыжэла сэрца ягонае.
6 І пытаўся Саўл у ГОСПАДА, але ГОСПАД яму не адказаў ані праз сон, ані праз урым, ані праз
прарокаў.
7 І сказаў Саўл слугам сваім: «Пашукайце мне жанчыну, якая выклікае духаў [памерлых]. Я
пайду да яе і запытаюся праз яе». І сказалі яму слугі ягоныя: «Вось, жанчына, якая выклікае
духаў памерлых, у Эндоры».
8 І перапрануўся Саўл, і апрануўся ў іншае адзеньне, і пайшоў сам, і два мужчыны з ім. І
прыйшлі яны да той жанчыны ўначы, і сказаў [Саўл]: «Паваражы мне і выкліч мне таго, пра
каго я табе скажу».
9 Жанчына сказала яму: «Вось, ты ведаеш, што зрабіў Саўл? Ён выгнаў варажбітоў і тых, якія
выклікаюць духаў, з зямлі гэтай. Чаму ты хочаш злавіць душу маю, каб забіць мяне?».
10 І Саўл прысягнуў на ГОСПАДА, кажучы: «Як жывы ГОСПАД! Ня будзе табе пакараньня ў
гэтай справе».
11 І спыталася ў яго жанчына: «Каго выклікаць табе?» Ён сказаў: «Выкліч мне Самуэля».
12 І ўбачыла жанчына Самуэля, і ўсклікнула моцным голасам, і сказала жанчына Саўлу,
кажучы: «Чаму ты падмануў мяне? Ты ж Саўл!»
13 І сказаў ёй валадар: «Ня бойся мяне. Што ты бачыш?» А тая жанчына сказала Саўлу: «Бачу
[чалавека] Божага, што выходзіць з зямлі».
14 І сказаў ёй [Саўл]: «Як ён выглядае?» Яна сказала: «Стары чалавек выходзіць, апрануты ў
доўгую шату». І пазнаў Саўл, што гэта Самуэль, і ўпаў перад ім аблічам да зямлі, і пакланіўся.
15 І сказаў Самуэль Саўлу: «Чаму ты не даеш мне супакою і выклікаеш мяне?» І сказаў Саўл:
«Я ў вялікім прыгнёце, бо Філістынцы ваююць супраць мяне, а Бог адступіўся ад мяне і не
адказвае мне ані праз прарокаў, ані праз сон. Дык я паклікаў цябе, каб ты навучыў мяне, што
я маю рабіць?»
16 І сказаў Самуэль: «Навошта ты пытаешся ў мяне, калі ГОСПАД адступіўся ад цябе і стаўся
ворагам тваім?
17 Зрабіў ГОСПАД так, як казаў праз мяне. ГОСПАД забраў валадарства з рукі тваёй і аддаў яго
бліжняму твайму Давіду,
18 бо ты ня слухаў голас ГОСПАДА, і ня зьдзейсьніў яраснага гневу Ягонага на Амалека. Таму
вось гэта ўчыніў табе ГОСПАД сёньня.
19 І аддасьць ГОСПАД Ізраіля разам з табою ў рукі Філістынцаў. Заўтра ты і сыны твае будзеце
са мною, таксама табар Ізраіля аддасьць ГОСПАД у рукі Філістынцаў».

20 І Саўл раптам упаў усім целам на зямлю, і ён вельмі спужаўся словаў Самуэля, і пакінулі
яго сілы, і ён ня еў хлеба ўвесь той дзень і ўсю тую ноч.
21 І падыйшла тая жанчына да Саўла, і ўбачыла, што ён надта перапалоханы, і сказала яму:
«Вось, нявольніца твая паслухала голас твой і аддала душу сваю ў далоні твае, бо я паслухалася
словаў тваіх, які ты гаварыў мне.
22 І цяпер ты таксама паслухай голасу нявольніцы тваёй. Я дам табе лусту хлеба, а ты зьеш, і
вернецца да цябе сіла, і ты зможаш вырушыць у дарогу».
23 Але ён адмовіўся і сказаў: «Ня буду есьці». Але слугі ягоныя і жанчына тая ўпрошвалі яго, і
ён паслухаў голас іхні, і ўстаў з зямлі, і сеў на ложку.
24 А жанчына тая мела кормнае цяля ў доме сваім, і яна пасьпешліва зарэзала яго, і ўзяла муку,
і рашчыніла яе, і напякла праснакоў.
25 І палажыла [гэта] перад Саўлам і перад слугамі ягонымі, і яны елі, і ўсталі, і пайшлі ў тую
самую ноч.

1 Сам 29

1 І сабралі Філістынцы ўсе дружыны свае ў Афэку, а Ізраільцяне разлажыліся табарам каля
крыніцы, якая ў Езрээлі.
2 І валадары Філістынскія крочылі на чале сотняў і тысячаў, а Давід з ваярамі сваімі крочыў у
канцы, пры Ахішу.
3 І сказалі князі Філістынскія: «Што гэта за Гебраі?» І сказаў Ахіш князям Філістынскім: «Гэта
Давід, слуга Саўла, валадара Ізраіля, які ў мяне ўжо год ці два, і я не знайшоў у ім нічога такога
ад дня, у які ён прыйшоў, аж да гэтага дня!»
4 І загневаліся на яго князі Філістынскія, і сказалі яму князі Філістынскія: «Выпраў [адсюль]
гэтага чалавека, і няхай ён вернецца на месца сваё, якое ты вызначыў яму, і няхай ён не ідзе
з намі ў бой, каб ня стаўся ён супраціўнікам нашым. Якім чынам ён можа вярнуць ласку
гаспадара свайго, калі не галовамі гэтых людзей?
5 Ці ж гэта ня той самы Давід, якому сьпявалі ў карагодах, кажучы: “Пабіў Саўл тысячы, а Давід
— дзясяткі тысячаў”?»
6 І паклікаў Ахіш Давіда, і сказаў яму: «Як жывы ГОСПАД! Ты — справядлівы і добры ў вачах
маіх, ты выходзіў і вяртаўся разам са мною ў табар, і я не знайшоў у табе нічога благога ад дня,
у які ты прыйшоў да мяне, аж да гэтага дня. Але ў вачах князёў ты нядобры.
7 Дык цяпер вярніся, і ідзі ў супакоі, і ня будзь ліхім у вачах валадароў Філістынскіх».
8 І сказаў Давід Ахішу: «Што я зрабіў, або што знайшоў ты ў слузе тваім ад дня, калі я прыйшоў
перад аблічча тваё, аж да гэтага дня, каб ня мог я ісьці і ваяваць супраць ворагаў гаспадара
майго, валадара?»
9 І адказаў Ахіш, і сказаў Давіду: «Ведаю, што ты добры ў вачах маіх, як анёл Божы, але
валадары Філістынскія сказалі: “Няхай не ідзе ён з намі ў бой”.
10 І цяпер устань раніцаю ты і слугі гаспадара твайго, якія прыйшлі з табой, і ўстаньце вельмі
рана, і калі пачне днець, адыйдзіце [адсюль]».
11 І ўстаў рана Давід і людзі ягоныя, каб вырушыць у дарогу раніцай і вярнуцца ў зямлю
Філістынскую. А Філістынцы пайшлі ў Езрээль.

1 Сам 30

1 І сталася, калі Давід і людзі ягоныя вярталіся ў Цыкляг, на трэці дзень Амалекцы напалі на
Нэгеў і Цыкляг, і здабылі Цыкляг, і спалілі агнём,
2 і забралі яны ў палон жанчынаў, якія ў ім былі, ад найменшай да найбольшай, але не забілі
нікога, і павялі з сабою, і вярталіся дарогай сваёй.
3 І прыйшоў Давід з людзьмі сваімі ў горад, і вось, ён спалены агнём, а жонкі іхнія і сыны, і
дочкі забраныя ў няволю.
4 І загаласілі Давід і народ, які быў з ім, і плакалі яны, аж пакуль ім хапіла сілаў для плачу.
5 І ўзялі ў палон абедзьвух жонак Давіда, Ахіноам з Езрээлю і Абігайль, жонку Наваля з
Кармэлю.

6 І Давід быў вельмі стрывожаны, і хацеў народ яго ўкаменаваць, бо горыч была ў душы
кожнага дзеля сыноў іхніх і дачок іхніх. Але Давід набраў сілы ў ГОСПАДЗЕ, Богу сваім,
7 і сказаў Давід сьвятару Абіятару, сыну Ахімэлеха: «Прынясі мне эфод!» І Абіятар прынёс
эфод Давіду.
8 І пытаўся Давід у ГОСПАДА, кажучы: «Ці гнацца за гэтай ардою? І ці я даганю іх?» І сказаў
яму [Госпад]: «Ганіся! Бо, даганяючы, дагоніш [іх] і адбярэш [здабычу]».
9 І пайшоў Давід сам і шэсьцьсот чалавек, якія з ім, і дайшлі да ручая Бэсор, і тыя, што
змучыліся, затрымаліся.
10 І перасьледаваў Давід і чатырыста чалавек, а дзьвесьце спыніліся, бо былі змучаныя і не
маглі перайсьці праз ручай Бэсор.
11 І знайшлі яны ў полі чалавека Эгіпцяніна, і прывялі яго да Давіда, і далі яму хлеба, і ён зьеў,
і далі яму вады напіцца.
12 І далі яму таксама кавалак сушаных фігаў і дзьве гронкі разынак. І ён зьеў, і вярнуўся да яго
дух ягоны, бо ён ужо тры дні і тры ночы ня еў хлеба і ня піў вады.
13 І сказаў яму Давід: «Чый ты і адкуль?» Ён сказаў: «Я — малады Эгіпцянін, слуга Амалекца.
Кінуў мяне гаспадар мой, бо я захварэў тры дні таму.
14 Мы напалі на Нэгеў Керэтаў, і на Нэгеў Юды, і на Нэгеў Халева, і Цыкляг спалілі агнём».
15 І сказаў яму Давід: «Завядзеш мяне да той арды?» Ён сказаў: «Прысягні мне на Бога, што
не заб'еш мяне і не аддасі мяне ў рукі гаспадара майго, і я завяду цябе да той арды».
16 І ён павёў яго. І вось, тая [арда] разыйшлася па абліччы ўсёй зямлі, елі і пілі, і сьвяткавалі
дзеля вялікай здабычы, сабранай у зямлі Філістынскай і ў зямлі Юды.
17 І забіваў іх Давід ад раніцы аж да вечару наступнага дня, і ніхто з іх не застаўся, акрамя
чатырохсот юнакоў, якія селі на вярблюдаў і ўцяклі.
18 І зьвярнуў Давід усё, што забралі Амалекцы, і вызваліў абедзьвух жонак сваіх.
19 І ніхто ў іх не загінуў, ад найменшага да найбольшага, ані сыны, ані дочкі, са здабычы і з
усяго, што тыя нарабавалі; усё забраў Давід назад.
20 І ўзяў Давід усе авечкі і быдла, і гналі іх перад ім, і казалі: «Вось здабыча Давіда!»
21 І прыйшоў Давід да тых двухсот чалавек, што былі змучаныя і не маглі ісьці з Давідам, і
засталіся каля ручая Бэсор. І выйшлі яны насустрач Давіду і людзям, якія з ім, і падыйшоў да
іх Давід, і прывітаў іх з мірам.
22 І адказалі ўсе людзі ліхія, [сыны] Бэліяла спасярод людзей, што хадзілі з Давідам, і сказалі:
«Тым, якія не пайшлі разам з намі, не давай здабычу, якую мы забралі. Няхай яны забяруць
толькі жонак сваіх і сыноў сваіх, і няхай ідуць».
23 І сказаў Давід: «Нельга рабіць так, браты мае, з тым, што даў нам ГОСПАД. Ён захаваў нас, і
аддаў арду гэтую, якая на нас напала, у рукі нашыя.
24 Хто паслухае вас у гэтай справе? Будуць мець аднолькавую частку і тыя, што ваявалі, і тыя,
што заставаліся ў табары, роўна будзе падзелена».
25 Ад гэтага дня сталася гэта пастановай, і звычаем, і прысудам для Ізраільцянаў аж па
сёньняшні дзень.
26 І прыйшоў Давід у Цыкляг, і паслаў ён частку здабычы старшыням Юды, сябрам сваім,
кажучы: «Гэта для вас дар са здабычы на ворагах ГОСПАДА».
27 І паслаў ён тым, што ў Бэтэлі, і тым, што ў Рамот-Нэгэве, і тым, што ў Яттыры,
28 і тым, што ў Араэры, і тым, што ў Сіфмоце, і тым, што ў Эштэмоа,
29 і тым, што ў Ракалі, і ў гарадах Ерахмээльцаў, і ў гарадах Кенэяў,
30 і тым, што ў Харме, Бор-Ашане і Атаху,
31 і тым, што ў Хеўроне, і ў-ва ўсе месцы, дзе праходзіў Давід і людзі ягоныя.

1 Сам 31

1 А Філістынцы ваявалі з Ізраілем, і Ізраільцяне пабеглі ад Філістынцаў, і падалі забітыя на
ўзгорышчы Гільбоа.

2 І дагналі Філістынцы Саўла і сыноў ягоных, і забілі Філістынцы Ёнатана, Абінадава і
Малькішуа, сыноў Саўла.
3 І бой ішоў толькі каля Саўла. І знайшлі яго лучнікі, і ён быў моцна паранены лучнікамі.
4 І сказаў Саўл збраяносцу свайму: «Вазьмі меч твой, і забі мяне ім, каб не прыйшлі гэтыя
неабрэзаныя і не забілі мяне самі, і ня зьдзекваліся з мяне». Але збраяносец не хацеў гэтага
зрабіць, бо вельмі баяўся. І Саўл узяў меч, і кінуўся на яго.
5 І ўбачыў збраяносец, што Саўл памёр, і таксама кінуўся на меч свой, і разам з ім памёр.
6 У той дзень загінулі разам Саўл і тры сыны ягоныя, і збраяносец ягоны, і ўсе людзі ягоныя.
7 І ўбачылі Ізраільцяне, што жылі на другім баку раўніны і на тым баку Ярдану, што войска
Ізраіля ўцякло і што загінулі Саўл і сыны ягоныя, і яны пакінулі гарады свае, і паўцякалі. І
прыйшлі Філістынцы, і абжыліся ў іх.
8 Назаўтра прыйшлі Філістынцы рабаваць забітых і знайшлі Саўла і трох сыноў ягоных, што
ляжалі на ўзгорышчы Гільбоа.
9 І адсеклі яны галаву ягоную, і забралі зброю ягоную, і па ўсёй зямлі Філістынскай паслалі
весьнікаў, каб абвясьціць у доме ідалаў сваіх і народу.
10 І палажылі яны зброю ягоную ў доме Астарты, а цела ягонае павесілі на муры Бэт-Шэану.
11 І пачулі жыхары Ябэшу Гілеадзкага пра тое, што Філістынцы ўчынілі з Саўлам,
12 і ўсталі ўсе ваяры мужныя, і ішлі ўсю ноч, і зьнялі цела Саўла і целы сыноў ягоных з муру
Бэт-Шэану, і прынесьлі іх у Ябэш, і спалілі іх там.
13 І ўзялі яны косткі іхнія, і пахавалі пад тамарыскам у Ябэшы, і посьцілі сем дзён.

ДРУГАЯ КНІГА САМУЭЛЯ

1 І сталася пасьля сьмерці Саўла, што Давід вярнуўся пасьля перамогі над Амалекам і спыніўся
на два дні ў Цыклягу.
2 І сталася на трэці дзень, вось, чалавек прыйшоў з табару, з [атачэньня] Саўла, у падзёртым
адзеньні і з пасыпанай зямлёй галавой. І прыйшоў ён да Давіда, і ўпаў на зямлю, і пакланіўся.
3 І сказаў яму Давід: «Адкуль ты прыйшоў?» Ён сказаў яму: «Я ўцёк з табару Ізраіля».
4 І сказаў яму Давід: «Што сталася? Распавядзі мне». Ён сказаў: «Людзі паўцякалі з месца бою,
і шмат народу загінула, таксама Саўл і Ёнатан, сын ягоны, загінулі».
5 І сказаў Давід юнаку, які яму расказваў [вестку]: «Адкуль ты ведаеш, што загінуў Саўл і
Ёнатан, сын ягоны?»
6 І сказаў юнак, які расказваў яму [вестку]: «Я ўзыйшоў на гару Гільбоа, і вось, Саўл ляжаў
прабіты дзідай сваёй, і вось, коньнікі і калясьніцы даганялі яго.
7 І ён аглянуўся, і ўбачыў мяне, і паклікаў мяне. І я сказаў: “Вось я”.
8 І ён сказаў мне: “Хто ты?” Я сказаў яму: “Я — з Амалека”.
9 І ён сказаў мне: “Падыйдзі да мяне, і забі мяне, бо туга сьмяротная ахапіла мяне, але душа
мая ўсё яшчэ ў-ва мне”.
10 Я падыйшоў да яго і забіў яго, бо ведаў, што ня будзе ён жыць пасьля падзеньня свайго, і ўзяў
я вянок з галавы ягонай і нараменьнік, які на рамёнах ягоных, і прынёс іх гаспадару майму».
11 І схапіўся Давід за шаты свае, і разьдзёр іх, і [так зрабілі] ўсе людзі, якія [былі] з ім.
12 І галасілі яны, і плакалі, і посьцілі аж да вечара дзеля Саўла і дзеля Ёнатана, сына ягонага, і
дзеля народу ГОСПАДА, і дзеля дому Ізраіля, якія пагінулі ад мяча.
13 І сказаў Давід юнаку, які [пра гэта] паведаміў яму: «Адкуль ты?» Ён адказаў: «Я — сын
прыхадня Амалекца».
14 І сказаў яму Давід: «Як ты адважыўся падняць руку тваю і забіць памазанца ГОСПАДАВАГА?»
15 І паклікаў Давід аднаго з юнакоў, і сказаў: «Падыйдзі і забі яго». І той забіў яго, і ён памёр.
16 І сказаў Давід: «Кроў твая на галаве тваёй, бо вусны твае сьведчылі супраць цябе, кажучы:
“Я забіў памазанца ГОСПАДАВАГА”».
17 І аплакваў Давід Саўла і Ёнатана, сына ягонага, гэтым жалобным сьпевам,
18 і загадаў навучыць яму сыноў Юды, і ён быў запісаны ў Кнізе Справядлівага, [і сказаў]:
19 «Слаўныя твае, Ізраілю, загінулі на ўзгорках тваіх. Як жа маглі загінуць такія волаты?!
20 Не расказвайце [гэтага] ў Гаце, не абвяшчайце на вуліцах Ашкелёну, каб ня цешыліся [з
гэтага] дочкі Філістынскія, каб ня радаваліся дочкі неабрэзаных.
21 Горы Гільбоа! Няхай [ня будзе] на вас ані расы, ані дажджу, ані палёў урадлівых, бо там
апаганены шчыт волатаў, шчыт Саўла ня быў памазаны алеем.
22 Без крыві забітых, бяз тлушчу волатаў лук Ёнатана ніколі не вяртаўся назад, і меч Саўла не
вяртаўся дарма.
23 Саўла і Ёнатана, якія любілі адзін аднаго і жылі ў згодзе, сьмерць таксама не разлучыла.
Хутчэйшыя за арлоў і дужэйшыя за ільвоў яны [былі].
24 Дочкі Ізраіля, плачце дзеля Саўла, які апранаў вас у кармазын з упрыгожваньнямі, які
ўскладаў аздобы залатыя на шаты вашыя.
25 Як жа маглі загінуць у баі такія волаты! Ёнатан забіты на ўзгорках тваіх.
26 Цяжка мне, бо [няма цябе], браце мой Ёнатан! Ты быў вельмі дарагі для мяне. Любоў твая
была для мяне даражэй за любоў жаночую.
27 Як маглі загінуць такія волаты? Загінула зброя баявая!»

2 Сам 2

1 Пасьля гэтага пытаўся Давід у ГОСПАДА, кажучы: «Ці маю пайсьці ў адзін з гарадоў
Юдэйскіх?» І ГОСПАД сказаў яму: «Ідзі». І сказаў Давід: «Куды маю ісьці?» І [Госпад] сказаў:

«У Хеўрон».
2 І пайшоў туды Давід і дзьве жонкі ягоныя, Ахіноам з Езрээлю і Абігайль, жонкай Наваля з
Кармэлю.
3 І павёў Давід людзей сваіх, якія з ім [былі], кожнага з домам ягоным, і яны абжыліся ў гарадах
Хеўрону.
4 І прыйшлі людзі Юды, і памазалі там Давіда на валадара над домам Юды. І паведамілі Давіду,
кажучы: «Людзі Ябэшу Гілеадзкага пахавалі Саўла».
5 І паслаў Давід пасланцоў да жыхароў Ябэшу Гілеадзкага, і сказаў ім: «Дабраслаўлёныя вы
ГОСПАДАМ, бо вы зьявілі міласэрнасьць гаспадару вашаму, Саўлу, і пахавалі яго.
6 Няхай цяпер ГОСПАД зьявіць вам міласэрнасьць і праўду, і я таксама зраблю вам добрае за
тое, што вы так учынілі.
7 Няхай цяпер умацуюццарукі вашыя, і вы будзьце адважнымі, бо памёр гаспадар ваш Саўл, а
мяне дом Юды памазаў на валадара над імі».
8 А Абнэр, сын Нэра, начальнік войска Саўла, узяў Ішбашэта, сына Саўла, і прывёў яго ў
Маханаім,
9 і паставіў яго валадаром над Гілеадам, і над Ашэрам, і над Езрээлем, і над Эфраімам, і над
Бэн'ямінам, і над усім Ізраілем.
10 Ішбашэт, сын Саўла, меў сорак гадоў, калі пачаў валадарыць над Ізраілем, і валадарыў ён
два гады. Толькі дом Юды прызнаваў [за валадара] Давіда.
11 І быў лік дзён, калі Давід валадарыў над домам Юды ў Хеўроне, сем гадоў і шэсьць месяцаў.
12 І выйшаў Абнэр, сын Нэра, і слугі Ішбашэта, сына Саўла, з Маханаіму ў Гібэон.
13 І Ёаў, сын Цэруі, і слугі Давіда выйшлі, і спаткаліся з імі каля сажалкі Гібэонскай. І адны
сталі на адным баку сажалкі, а другія — на другім баку сажалкі.
14 І сказаў Абнэр Ёаву: «Няхай юнакі ўстануць і няхай пагуляюць перад намі». Ёаў сказаў:
«Няхай устануць».
15 І ўсталі, і пайшлі дванаццаць Бэн'ямінцаў з боку Ішбашэта, сына Саўла, і дванаццаць
спасярод слугаў Давіда.
16 І схапіў кожны свайго супраціўніка за галаву, і ўсадзіў меч у бок ягоны, і паваліліся разам.
І названае месца тое Хелкат-Гаццурым, што ў Гібэоне.
17 І была ў той дзень вельмі цяжкая бітва, і былі пераможаныя Абнэр і людзі Ізраіля слугамі
Давіда.
18 І былі там тры сыны Цэруі: Ёаў, Абішай і Асаэль. І Асаэль быў вельмі хуткім у нагах, як сарна
ў полі.
19 І пагнаўся Асаэль за Абнэрам, і не зварочваў ані ўправа, ані ўлева ад Абнэра.
20 І аглянуўся Абнэр назад, і сказаў: «Ці гэта ты, Асаэль!?» Ён сказаў: «Я».
21 І сказаў яму Абнэр: «Павярніся ўправа ці ўлева і схапі аднаго з юнакоў, і вазьмі сабе здабычу
з яго». Але Асаэль не хацеў адступіцца ад яго.
22 І зноў аглянуўся Абнэр, кажучы Асаэлю: «Адступіся ад мяне. Навошта маю прыбіць цябе да
зямлі, і тады не змагу падняць аблічча маё перад Ёавам, братам тваім».
23 Але той не хацеў адступіцца [ад яго]. І Абнэр ударыў яго дзідаю ў жывот; і дзіда прайшла яго
наскрозь, і ён упаў там, і памёр. І ўсе, хто праходзіў праз тое месца, дзе ўпаў Асаэль і памёр,
спыняліся.
24 І перасьледавалі Ёаў і Абішай Абнэра. Сонца ўжо зайшло, і яны прыйшлі да ўзгорышча Амма,
якое каля Гіі, пры дарозе ў пустыню Гібэонскую.
25 І сабраліся сыны Бэн'яміна вакол Абнэра, і сталі як адна дружына, і затрымаліся на вяршыні
ўзгорка.
26 І закрычаў Абнэр да Ёава, і сказаў: «Ці аж безупынна будзе нішчыць меч твой? Ці ты ня
ведаеш, што вынікі будуць горкімі? І калі ты скажаш народу, каб ён вярнуўся з [пагоні] за
братамі сваімі?»
27 І сказаў Ёаў: «Як жывы Бог, калі б ты не казаў іначай, яшчэ б зранку спыніўся народ
[перасьледаваць] братоў сваіх».

28 І Ёаў затрубіў у рог, і спыніўся ўвесь народ, і не перасьледавалі болей Ізраіля, і больш ужо
не ваявалі.
29 А Абнэр і людзі ягоныя ішлі ўсю ноч праз Арабу, і перайшлі Ярдан, і прайшоўшы ўвесь
Бітрон, прыйшлі ў Маханаім.
30 І вярнуўся Ёаў з [пагоні] за Абнэрам, і сабраў увесь народ, і сярод слугаў Давіда не хапала
дзевятнаццаці чалавек і Асаэля.
31 А слугі Давіда забілі трыста шэсьцьдзясят Бэн'ямінцаў і людзей, што былі з Абнэрам.
32 І ўзялі яны Асаэля, і пахавалі яго ў магіле бацькі ягонага, што ў Бэтлееме. І Ёаў і людзі ягоныя
ішлі ўсю ноч і на самым сьвітаньні [дайшлі] да Хеўрону.

2 Сам 3

1 І была доўгая вайна паміж домам Саўла і домам Давіда. І Давід ставаўся мацнейшым, а дом
Саўла слабеў.
2 І нарадзіліся ў Давіда сыны ў Хеўроне. Першародным быў Амнон ад Ахіноам з Езрээлю,
3 а другім быў Хілеаў ад Абігайль, жонкі Наваля з Кармэлю, а трэцім — Абсалом, сын Маахі,
дачкі Тальмая, валадара Гешуру,
4 а чацьвёртым — Адонія, сын Хагіты, а пятым — Шэфатыя, сын Абіталі,
5 а шостым — Ітрэам ад Эглі, жонкі Давіда. Яны нарадзіліся Давіду ў Хеўроне.
6 І калі была вайна паміж домам Саўла і домам Давіда, Абнэр ставаўся мацнейшым у доме
Саўла.
7 У Саўла была наложніца на імя Рыцпа, дачка Аі. І сказаў [Ішбашэт] Абнэру: «Чаму ты ўвайшоў
да наложніцы бацькі майго?»
8 І моцна ўзлаваўся Абнэр дзеля словаў Ішбашэта, і сказаў: «Ці ж я — сабачая галава з Юды?
Сёньня я зьяўляю міласэрнасьць дому Саўла, бацькі твайго, братам ягоным і сябрам ягоным,
і цябе не аддаў у рукі Давіда, а ты сварышся на мяне сёньня з прычыны жанчыны гэтай?
9 Няхай гэта зробіць Бог з Абнэрам, і яшчэ дадасьць, калі я не зраблю Давіду так, як ГОСПАД
запрысяг яму,
10 што Ён забярэ валадарства ў дома Саўла і паставіць пасад Давіда над Ізраілем і над Юдам, ад
Дану аж да Бээр-Шэвы».
11 І той ня мог адказаць Абнэру ані слова, бо баяўся яго.
12 І паслаў Абнэр пасланцоў ад сябе да Давіда, кажучы: «Чыя гэта зямля?», і [яшчэ] кажучы:
«Заключы запавет са мной, і вось, рука мая будзе з табою, каб прывесьці да цябе ўвесь Ізраіль».
13 І сказаў [Давід]: «Добра, я заключу з табой запавет, але толькі прашу цябе пра адну рэч,
кажучы: "Ты ня ўбачыш аблічча майго, калі не прывядзеш Міхаль, дачку Саўла, калі прыйдзеш
убачыць аблічча маё"».
14 І паслаў Давід пасланцоў да Ішбашэта, сына Саўла, кажучы: «Вярні мне жонку маю Міхаль,
якую я набыў за сто скуравінак Філістынскіх».
15 І паслаў Ішбашэт, і ўзяў яе ад мужа ейнага, Пальтыэля, сына Ляіша.
16 І ішоў за ёй муж ейны, плачучы аж да Бахурыму, але Абнэр сказаў яму: «Вяртайся
[дадому]!» І ён вярнуўся.
17 І зьвярнуўся Абнэр да старшыняў Ізраіля, кажучы: «Яшчэ ўчора і пазаўчора хацелі вы мець
валадаром сваім Давіда.
18 І цяпер зрабіце гэта, бо ГОСПАД сказаў Давіду, кажучы: "У руцэ слугі Майго Давіда
выратаваньне народу Майго, Ізраіля, з рук Філістынцаў і з рук усіх ворагаў ягоных"».
19 І гаварыў [гэта] Абнэр у вушы Бэн'ямінцам. І пайшоў Абнэр у Хеўрон, каб сказаць у вушы
Давіду ўсё, што добрае ў вачах Ізраіля і ў вачах усяго дому Бэн'яміна.
20 І прыйшоў Абнэр да Давіда ў Хеўрон, і дваццацьць ваяроў з ім, і Давід справіў банкет Абнэру
і людзям ягоным, што былі з ім.
21 І сказаў Абнэр Давіду: «Я ўстану і пайду, і зьбяру да гаспадара майго, валадара, увесь Ізраіль;
і ўвойдуць яны з табой у запавет, і будзеш ты валадарыць над усім, як жадае душа твая». І
адпусьціў Давід Абнэра, і ён пайшоў у супакоі.

22 І вось, слугі Давіда і Ёаў прыйшлі з выправы і прынесьлі вялікую здабычу. А Абнэра не было
з Давідам у Хеўроне, бо [Давід] адпусьціў яго, і ён пайшоў у супакоі.
23 І прыйшоў Ёаў і войска, якое з ім, і паведамілі Ёаву, кажучы: «Абнэр, сын Нэра, прыйшоў да
валадара, і ён адпусьціў яго, і ён пайшоў у супакоі».
24 І прыйшоў Ёаў да валадара, і сказаў: «Што ты зрабіў? Вось, прыйшоў да цябе Абнэр. Навошта
ты адпусьціў яго, і ён адыйшоў?
25 Ты ведаеш Абнэра, сына Нэра. Ён прыйшоў, каб падмануць цябе, і даведацца пра ўваход
твой і выхад твой, і даведацца, што ты робіш».
26 І выйшаў Ёаў ад Давіда, і паслаў пасланцоў за Абнэрам, і яны вярнулі яго ад Бор-Гасіры, а
Давід ня ведаў [пра гэта].
27 І вярнуўся Абнэр у Хеўрон, а Ёаў адвёў яго ў сярэдзіну брамы, каб з ім таемна пагаварыць, і
ўдарыў яго там [мячом] у жывот, і памёр [Абнэр] за кроў Асаэля, брата Ёава.
28 І пачуў Давід пра гэта, і сказаў: «Не вінаваты ані я, ані валадарства маё перад ГОСПАДАМ на
вякі ў крыві Абнэра, сына Нэра.
29 Няхай спадзе яна на галаву Ёава і на ўвесь дом бацькі ягонага; няхай не спыняецца ў доме
Ёава хворы на выцёкі, пракажоны, той, які ходзіць з кійком, забіты ад мяча і той, хто патрабуе
хлеба».
30 А Ёаў і Абішай, брат ягоны, забілі Абнэра за тое, што ён забіў Асаэля, брата іхняга, у Гібэоне
ў час бою.
31 І сказаў Давід Ёаву і ўсяму народу, які з ім: «Разьдзярыце адзеньне вашае і апраніцеся ў
рызьзё, і лямантуйце дзеля Абнэра». І валадар Давід ішоў за целам ягоным.
32 І пахавалі Абнэра ў Хеўроне, валадар узьняў голас свой і плакаў над магілай Абнэра, і плакаў
увесь народ.
33 І засьпяваў валадар жалобны сьпеў дзеля Абнэра, і сказаў: «Ці ж сьмерцю нікчэмнага мусіў
паміраць Абнэр?
34 Рукі твае не былі зьвязаныя, і ногі твае не былі закутыя ў кайданы, а ты загінуў, як гінуць ад
злодзеяў». І ўвесь народ пачаў яшчэ больш плакаць над ім.
35 І прыйшоў увесь народ прапанаваць Давіду хлеба, калі быў яшчэ дзень, але прысягнуў
Давід, кажучы: «Няхай тое і тое зробіць мне Бог, і яшчэ дадасьць, калі я перад заходам сонца
пакаштую хлеба або чаго іншага».
36 І ўвесь народ даведаўся гэта, і было добрым гэта ў вачах ягоных, як і ўсё, што рабіў валадар,
было добрым у вачах усяго народу.
37 І даведаўся ўвесь народ і ўвесь Ізраіль у той дзень, што Абнэр, сын Нэра, быў забіты не праз
валадара.
38 І сказаў валадар слугам сваім: «Ці ж вы ня ведаеце, што сёньня ў Ізраілі загінуў князь і вялікі
чалавек?
39 Я цяпер яшчэ слабы, хоць і памазаны на валадара, а гэтыя людзі, сыны Цэруі, мацнейшыя
за мяне. Няхай адплаціць ГОСПАД злачынцы паводле ліхоты ягонай».

2 Сам 4

1 І пачуў сын Саўла, што памёр Абнэр у Хеўроне, і самлелі рукі ягоныя, і ўвесь Ізраіль
стрывожыўся.
2 Сын Саўла меў двух начальнікаў войска, адзін меў імя Баана, а імя другога — Рэхаў, сыны
Рымона з Бээроту, з сыноў Бэн'яміна, бо Бээрот залічалі да Бэн'яміна.
3 А жыхары Бээроту ўцяклі ў Гіттаім і [жывуць] там прыхаднямі аж па сёньняшні дзень.
4 А Ёнатан, сын Саўла, меў кульгавага сына. Бо калі ён меў пяць гадоў, надыйшла вестка з
Езрээлю пра Саўла і Ёнатана, і нянька ягоная схапіла яго, і ўцякла. І калі яна пасьпешліва
ўцякала, ён упаў і скалечыўся. А імя ягонае — Мэфібашэт.
5 І пайшлі сыны Рымона з Бээроту, Рэхаў і Баана, і ўвайшлі ў сьпякоту дня ў дом Ішбашэта, і
ён спаў у [сьпякоту] дня.

6 І ўвайшлі Рэхаў і Баана, брат ягоны, у сярэдзіну дома, [нібы] ўзяць пшаніцы; і ўдарылі
[Ішбашэта] пад рэбры, і ўцяклі.
7 І яны ўвайшлі ў дом, а ён спаў на ложку сваім у спальні сваёй. І яны ўдарылі яго, і забілі, і
адсеклі галаву ягоную, і ішлі ўсю ноч дарогай Арабы.
8 І прынесьлі яны галаву Ішбашэта Давіду ў Хеўрон, і сказалі валадару: «Вось галава Ішбашэта,
сына Саўла, ворага твайго, які цікаваў на душу тваю. І даў ГОСПАД гаспадару нашаму,
валадару, адпомсьціць сёньня Саўлу і насеньню ягонаму».
9 І адказаў Давід Рэхаву і Баану, брату ягонаму, сынам Рымона з Бээроту, і сказаў ім: «Як жывы
ГОСПАД, Які вызваліў душу маю з усякага ўціску.
10 Калі таго, хто паведаміў мне, кажучы: “Вось, Саўл памёр”, і быў ён дабравесьнікам у вачах
сваіх, я схапіў і забіў у Цыклягу, і ня даў яму нагароду,
11 тым больш цяпер, калі ліхія людзі забілі праведнага чалавека ў доме ягоным на ложку
ягоным. Няўжо я ня буду шукаць кроў ягоную на руках вашых і ня зьнішчу вас з зямлі?»
12 І загадаў Давід юнакам, і яны забілі іх, і адсеклі рукі іхнія і ногі іхнія, і павесілі іх каля сажалкі
ў Хеўроне. А галаву Ішбашэта занесьлі і пахавалі ў магіле Абнэра ў Хеўроне.

2 Сам 5

1 І прыйшлі ўсе калены Ізраіля да Давіда ў Хеўрон, і сказалі: «Вось, мы — косткі твае і цела
тваё.
2 Яшчэ ўчора і пазаўчора, калі Саўл валадарыў над намі, ты выводзіў і прыводзіў назад Ізраіля.
І ГОСПАД сказаў табе: “Ты будзеш пасьвіць народ Мой, Ізраіля, і ты будзеш правадыром
Ізраіля”».
3 І прыйшлі да валадара ў Хеўрон усе старшыні Ізраіля, і валадар Давід заключыў з імі запавет
у Хеўроне перад абліччам ГОСПАДА. І памазалі Давіда на валадара над Ізраілем.
4 Трыццаць гадоў меў Давід, калі пачаў валадарыць, і сорак гадоў валадарыў.
5 У Хеўроне над Юдам ён валадарыў сем гадоў і шэсьць месяцаў, а ў Ерусаліме валадарыў
трыццаць тры гады над усім Ізраілем і над Юдам.
6 Валадар і ўсе людзі, якія былі з ім, вырушылі на Ерусалім супраць Евусэяў, жыхароў зямлі
гэтай. А тыя сказалі Давіду, кажучы: «Ня ўвойдзеш ты сюды, бо выганяць цябе сьляпыя і
кульгавыя». Гэта значыла: «Ня ўвойдзе сюды Давід».
7 Але Давід здабыў крэпасьць Сыён, і ён [стаў] горадам Давіда.
8 І сказаў Давід у той дзень: «Кожны, хто ваюе з Евусэямі, няхай ідзе праз вадаспад, і
няхай [дабярэцца] да кульгавых і сьляпых, якіх ненавідзіць душа Давіда». Таму кажуць [у
прыказцы]: «Сьляпы і кульгавы ня ўвойдуць у дом».
9 І абжыўся Давід у крэпасьці, і назваў яе горадам Давіда. І адбудаваў Давід яго кругом ад Мілло
і да дому [свайго].
10 І Давід ставаўся штораз магутнейшы, і ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, [быў] з ім.
11 І паслаў Хірам, валадар Тыру, пасланцоў да Давіда, і дрэва кедровае, і цесьляроў, і муляроў,
каб пабудавалі дом Давіду.
12 І даведаўся Давід, што ГОСПАД паставіў яго валадаром над Ізраілем і што Ён узвысіў
валадараньне ягонае дзеля народу Свайго, Ізраіля.
13 І ўзяў Давід яшчэ наложніцаў і жонак у Ерусаліме пасьля таго, як перасяліўся з Хеўрону. І
яны нарадзілі Давіду яшчэ сыноў і дочак.
14 Вось імёны тых, якія нарадзіліся ў яго ў Ерусаліме: Шамуа, Шаваў, Натан і Салямон,
15 Ібхар, Элішуа, Нэфэг і Яфія,
16 Элішама, Эліяда і Эліфалет.
17 І пачулі Філістынцы, што Давіда памазалі на валадара над Ізраілем, і сабраліся ўсе
Філістынцы, каб шукаць Давіда. І Давід пачуў [пра гэта], і ўвайшоў у крэпасьць.
18 І Філістынцы прыйшлі, і разлажыліся ў даліне Рэфаім.
19 І пытаўся Давід у ГОСПАДА, кажучы: «Ці пайсьці мне на Філістынцаў? Ці Ты аддасі іх у рукі
мае?» І ГОСПАД сказаў Давіду: «Ідзі, бо Я аддам Філістынцаў у рукі твае».

20 І пайшоў Давід у Баал-Пэрацым, і разьбіў іх там Давід, і сказаў: «Разьдзяліў ГОСПАД ворагаў
маіх перад абліччам маім, як разьдзяляюцца воды». Таму тое месца названае Баал-Пэрацым.
21 І пакінулі яны там ідалаў сваіх, і захапілі іх Давід і людзі ягоныя.
22 І прыйшлі зноў Філістынцы, і разлажыліся ў даліне Рэфаім.
23 І Давід пытаўся ў ГОСПАДА, і Ён сказаў: «Не выходзь, але абыйдзі іх кругом і выйдзі да іх з
боку дрэваў бальзамовых.
24 І калі пачуеш гук крокаў на вершалінах дрэваў бальзамовых, сьпяшайся, бо тады выйдзе
ГОСПАД перад абліччам тваім, каб разьбіць табар Філістынскі».
25 І зрабіў Давід так, як загадаў яму ГОСПАД, і перамог Філістынцаў ад Гевы аж да ўваходу ў
Гэзэр.

2 Сам 6

1 І сабраў Давід усіх выбранцоў з Ізраіля ў ліку трыццаці тысячаў.
2 І ўстаў Давід, і пайшоў з усім народам, які з ім, да Баал-Юды, каб адтуль прынесьці Каўчэг
Божы, над якім клікалі імя ГОСПАДА Магуцьцяў, Які сядзіць на херувімах.
3 І паставілі яны Каўчэг Божы на новы воз, і вынесьлі яго з дому Абінадава, які на ўзгорку. А
Уза і Ахія, сыны Абінадава, вялі новы воз.
4 І забралі [Каўчэг] Божы з дому Абінадава, які на ўзгорку, і Ахія ішоў перад Каўчэгам.
5 А Давід і ўвесь дом Ізраіля гралі перад ГОСПАДАМ на інструмэнтах з дрэва кіпарысавага, на
гусьлях, псалтырах, бубнах, пішчалках і цымбалах.
6 І прыйшлі яны на ток Нахона, і Уза выцягнуў [руку] ў бок Каўчэгу Божага, і прытрымаў яго,
бо валы тузануліся.
7 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА супраць Узы, і ўдарыў яго там Бог за правіну, і ён памёр там пры
Каўчэгу Божым.
8 І засмуціўся Давід, што ГОСПАД пакараў Узу, і назваў тое месца Пэрэц-Уза аж да сёньняшняга
дня.
9 У той дзень Давід спалохаўся ГОСПАДА і сказаў: «Як да мяне прыйдзе Каўчэг ГОСПАДА?»
10 І не хацеў Давід везьці Каўчэг ГОСПАДА да сябе ў горад Давіда, але накіраваў яго ў дом Абэд-
Эдому з Гату.
11 І заставаўся Каўчэг ГОСПАДА ў доме Абэд-Эдому з Гату тры месяцы, і дабраславіў ГОСПАД
Абэд-Эдома і ўвесь дом ягоны.
12 І паведамілі валадару Давіду, кажучы: «Дабраславіў ГОСПАД дом Абэд-Эдома і ўсё, што ў
яго, дзеля Каўчэгу Божага». І пайшоў Давід, і перанёс Каўчэг Божы з дому Абэд-Эдома ў горад
Давіда з радасьцю.
13 І калі тыя, што несьлі [Каўчэг], праходзілі шэсьць крокаў, ён складаў у ахвяру вала або
тлустае цяля.
14 І скакаў Давід з усёй сілы перад абліччам ГОСПАДА. І быў апрануты Давід у ільняны эфод.
15 І Давід і ўвесь дом Ізраіля несьлі Каўчэг ГОСПАДА з ускліканьнямі і гукам трубаў.
16 І калі Каўчэг ГОСПАДА прыйшоў у горад Давіда, Міхаль, дачка Саўла, глядзела праз вакно, і
ўбачыла Давіда, які скакаў і танчыў перад абліччам ГОСПАДА, і пагрэбавала ім у сэрцы сваім.
17 І прынесьлі Каўчэг ГОСПАДА, і паставілі яго на месцы ягоным, на сярэдзіне намёту, які
паставіў для яго Давід. І склаў Давід перад абліччам ГОСПАДА цэласпаленьні і ахвяры мірныя.
18 А калі скончыў Давід складаць ахвяры цэласпаленьня і ахвяры мірныя, ён дабраславіў народ
у імя ГОСПАДА Магуцьцяў.
19 І раздаў ён усяму мноству Ізраіля, кожнаму асобна, як мужчыну, так і жанчыне, па адным
бохане хлеба, і па кавалку мяса, і па адной [жмені] разынак. І пайшоў увесь народ у дамы свае.
20 І вярнуўся Давід, каб дабраславіць дом свой. І выйшла на спатканьне Давіда Міхаль, дачка
Саўла, і сказала: «Як праславіўся сёньня валадар Ізраіля, агаліўшыся на вачах нявольніцаў
слугаў сваіх, быццам агаляецца нейкі пусты чалавек!»

21 І сказаў Давід Міхалі: «Перад абліччам ГОСПАДА, Які выбраў мяне замест бацькі твайго і
ўсяго дому ягонага, каб паставіць мяне правадыром народу ГОСПАДА, Ізраіля, перад абліччам
ГОСПАДА буду танчыць,
22 і ўпакоруся яшчэ болей, і стануся яшчэ больш паніжаны ў вачах маіх, але перад
нявольніцамі, пра якіх ты кажаш, буду праслаўлены».
23 І Міхаль, дачка Саўла, ня мела дзяцей да дня сьмерці сваёй.

2 Сам 7

1 І валадар абжыўся ў доме сваім, і ГОСПАД даў яму супачынак ад усіх ворагаў ягоных навокал.
2 І сказаў валадар прароку Натану: «Вось, я жыву ў доме кедровым, а Каўчэг Божы знаходзіцца
ў намёце».
3 І сказаў Натан Давіду: «Усё, што ў сэрцы тваім, рабі, бо ГОСПАД з табою».
4 І сталася, што ў тую ноч было слова ГОСПАДА да Натана, кажучы:
5 «Ідзі і скажы слузе Майму Давіду: “Гэта кажа ГОСПАД. Ці ты збудуеш Мне дом на
пражываньне?
6 Бо ня жыў Я ў доме ад дня, у які вывеў сыноў Ізраіля з Эгіпту, аж да гэтага дня, але вандраваў
Я ў намёце і ў сялібе.
7 Ці ў час вандроўкі, якую праходзіў Я з усімі сынамі Ізраіля, казаў Я слова хоць аднаму з
каленаў Ізраіля, якому даручыў пасьвіць народ Мой Ізраіля, кажучы: "Чаму не пабудавалі вы
Мне дому кедровага?"?”
8 І цяпер гэта скажаш слузе Майму Давіду: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Я ўзяў цябе з месца
супачынку авечак, каб быў ты правадыром народу Майго Ізраіля.
9 І Я быў усюды з табою, дзе ты хадзіў, і Я выгубіў усіх ворагаў тваіх перад абліччам тваім, і
зрабіў вялікім імя тваё як імя аднаго з вялікіх на зямлі.
10 І Я вызначыў месца народу Майму Ізраілю, і Я ўмацую яго, і пасялю яго там, і ня будзе ён
болей трывожаны, і Я ня дам яго ўціскаць людзям нягодным як [было] на пачатку.
11 Ад дня, калі Я паставіў судзьдзяў для народу Майго Ізраіля, Я даў табе супачынак ад усіх
ворагаў тваіх. І паведаміў табе ГОСПАД, што ГОСПАД пабудуе табе дом.
12 А калі споўняцца дні твае і ты супачынеш з бацькамі тваімі, Я ўзбуджу насеньне тваё пасьля
цябе, якое выйдзе з нутра твайго, і ўмацую валадарства ягонае.
13 Ён пабудуе дом для імя Майго, і Я ўмацую пасад валадарства ягонага на вякі.
14 Я буду яму бацькам, а ён будзе Мне сынам. Калі ён будзе блукаць, Я буду караць яго дубцом
людзкім і плягамі сыноў чалавечых.
15 Але міласэрнасьці Маёй не спыню адносна яго, як спыніў адносна Саўла, якога Я адкінуў
перад абліччам тваім.
16 І будзе трывалым дом твой, і валадарства тваё будзе перад абліччам вечна, і пасад твой
будзе трываць на вякі”».
17 Гэтымі ўсімі словамі і паводле ўсяго відзежу гэтага прамовіў Натан да Давіда.
18 І пайшоў валадар Давід, і сеў перад абліччам ГОСПАДА, і сказаў: «Хто я, Госпадзе ГОСПАДЗЕ,
і што ёсьць дом мой, што Ты прывёў мяне аж сюды?
19 Але і гэта здавалася Табе замала, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, і Ты сказаў таксама пра род слугі
Твайго на будучыню. І такі будзе закон чалавечы, Госпадзе ГОСПАДЗЕ!
20 Дык што яшчэ можа сказаць Табе Давід? Ты ведаеш слугу Твайго, Госпадзе ГОСПАДЗЕ.
21 Дзеля слова Твайго і паводле сэрца Твайго ўчыніў Ты гэтыя вялікія рэчы і даў пазнаць [Цябе]
слузе Твайму.
22 Магутны Ты, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, і нікога няма падобнага да Цябе, і няма Бога, апрача Цябе,
паводле ўсяго таго, што чулі вушы нашыя.
23 Ці ёсьць хто яшчэ, як народ Твой, Ізраіль? Ці ёсьць на зямлі народ, дзеля якога Бог прыйшоў,
каб адкупіць яго Сабе за народ і праславіць імя Сваё, і ўчыніць для яго вялікія і страшныя рэчы
ў зямлі Тваёй, выганяючы перад народам Тваім, які Ты вызваліў з Эгіпту, народы і багоў іхніх?

24 Ты паставіў народ Твой, Ізраіля, як выбраны народ Твой на вякі, і Ты, ГОСПАДЗЕ, стаўся яму
Богам.
25 І цяпер, ГОСПАДЗЕ Божа, умацуй на вякі слова Тваё, якое сказаў Ты адносна слугі Твайго і
дому ягонага, і выканай тое, што прамовіў.
26 І будуць славіць на вякі імя Тваё, кажучы: “ГОСПАД Магуцьцяў — Бог Ізраіля”. А дом слугі
Твайго Давіда будзе моцна стаяць перад абліччам Тваім.
27 Бо Ты, ГОСПАДЗЕ Магуцьцяў, Божа Ізраіля, абвясьціў у вушы слузе Твайму, кажучы: “Я
пабудую табе дом”, таму я асьмеліўся ў сэрцы сваім прасіць Цябе ў гэтай малітве.
28 І цяпер, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, Ты — Бог, і словы Твае праўдзівыя, і Ты абяцаў слузе Твайму
гэтае дабро.
29 Будзь жа ласкавы і дабраславі дом слугі Твайго, каб быў ён вечна перад абліччам Тваім,
бо Ты, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, прамовіў [гэта], і няхай дабраславенствам Тваім будзе вечна
дабраслаўлёны дом слугі Твайго».

2 Сам 8

1 І сталася пасьля гэтага, Давід разьбіў Філістынцаў і падпарадкаваў іх. І ўзяў Давід з рук
Філістынцаў Мэтэг і ваколіцы.
2 І разьбіў ён Мааўлянаў, і зьмерыў іх вяроўкаю, палажыўшы на зямлю; дзьве вяроўкі адмяраў
для тых, што мелі быць забітыя, а адну вяроўку для тых, што мелі застацца пры жыцьці. І
Мааўляне сталіся слугамі Давіда, і прыносілі яму даніну.
3 І пабіў Давід Гададэзэра, сына Рэхова, валадара Цовы, калі той пайшоў, каб паставіць руку
сваю над ракой Эўфрат.
4 І ўзяў у яго Давід тысячу семсот коньнікаў і дваццаць тысячаў пяхотнікаў. І паперарэзваў
Давід жылы ў-ва ўсіх [коняў] тых калясьніцаў, і пакінуў з іх сабе сто калясьніцаў.
5 І прыйшоў Арам з Дамаску на дапамогу Гададэзэру, валадару Цовы, і Давід пабіў у Арама
дваццаць дзьве тысячы чалавек.
6 І паставіў Давід залогі ў Араме ў Дамаску, і Арам стаўся слугой Давіда, і прыносіў яму даніну.
І ГОСПАД выбаўляў Давіда ў-ва ўсіх выправах ягоных.
7 І ўзяў Давід залатую зброю, якую мелі слугі Гададэзэра, і прынёс яе ў Ерусалім.
8 А з Бэтаху і Бэратаю, гарадоў Гададэзэра, узяў Давід вельмі шмат медзі.
9 І пачуў Тоў, валадар Хамату, што Давід перамог усё войска Гададэзэра,
10 і паслаў Тоў сына свайго Ярама да валадара Давіда прывітаць яго і дабраславіць яго, што ён
ваяваў з Гададэзэрам і пабіў яго, бо Тоў і Гададэзэр былі ворагамі. І ў руцэ [Ярама] былі рэчы
срэбныя, рэчы залатыя і рэчы мядзяныя.
11 І валадар Давід пасьвяціў таксама гэта для ГОСПАДА разам са срэбрам і золатам, якое забраў
ён у-ва ўсіх упакораных народаў:
12 у Арама, Мааўлянаў, сыноў Амона, Філістынцаў, Амалекцаў, і са здабычы Гададэзэра, сына
Рэхова, валадара Цовы.
13 І праславіў Давід імя сваё, калі, вяртаючыся, пабіў Арама ў Саляной даліне, васямнаццаць
тысячаў чалавек.
14 І паставіў ён у Эдоме залогу, і ўвесь Эдом стаўся слугою Давіда. І ГОСПАД выбаўляў Давіда
ў-ва ўсіх выправах ягоных.
15 І валадарыў Давід над усім Ізраілем, і чыніў Давід суд і праведнасьць усяму народу свайму.
16 І Ёаў, сын Цэруі, [быў] над войскам, а Язафат, сын Ахілюда — канцлер,
17 Цадок, сын Ахітува, і Абіятар, сын Ахімэлеха, — святары, а Сэрая — пісар,
18 Бэная, сын Егаяды, — над Керэтамі і Пэлетамі, а сыны Давіда былі сьвятарамі.

2 Сам 9

1 І сказаў Давід: «Ці застаўся яшчэ хто з дому Саўла, бо я зьяўлю міласэрнасьць яму дзеля
Ёнатана?»
2 А з дому Саўла [застаўся] адзін слуга на імя Цыва. І паклікалі яго да Давіда, і валадар сказаў
яму: «Ці ты Цыва?» Ён сказаў: «Слуга твой».

3 І сказаў валадар: «Ці застаўся яшчэ хто з дому Саўла, каб я зьявіў яму міласэрнасьць Божую?»
І сказаў Цыва валадару: «Яшчэ [застаўся] сын Ёнатана, хворы на ногі».
4 І сказаў яму валадар: «Дзе ён?» А Цыва сказаў валадару: «Вось, ён у доме Махіра, сына
Аміэля, у Лёдэбары».
5 І валадар Давід паслаў па яго, і ўзяў яго з дому Махіра, сына Аміэля, з Лёдэбару.
6 І прыйшоў Мэфібашэт, сын Ёнатана, сына Саўла, да Давіда, і ўпаў на аблічча сваё, і пакланіўся.
І сказаў Давід: «Мэфібашэт». Ён сказаў: «Вось слуга твой».
7 І сказаў яму Давід: «Ня бойся, бо я зьяўлю табе міласэрнасьць дзеля Ёнатана, бацькі твайго,
і я зьвярну табе ўсе палі Саўла, бацькі твайго, і ты будзеш есьці хлеб са стала майго заўсёды».
8 І той пакланіўся, і сказаў: «Хто ж [ёсьць] слуга твой, што ты зьвярнуў увагу на здохлага
сабаку, такога, як я».
9 І паклікаў валадар Цыву, слугу Саўла, і сказаў яму: «Усё тое, што належала Саўлу і ўсяму
дому ягонаму, я перадаю сыну гаспадара твайго.
10 І будзеш яму служыць на ральлі ты, і сыны твае, і слугі твае, і будзеш прынось [плады], і
будзе хлеб у сына гаспадара твайго, і ён будзе есьці [яго]. І Мэфібашэт, сын гаспадара твайго,
будзе есьці заўсёды хлеб са стала майго». А Цыва меў пятнаццаць сыноў і дваццаць слугаў.
11 І сказаў Цыва валадару: «Як загадаў гаспадар мой, валадар, слузе твайму, так і зробіць слуга
твой». І Мэфібашэт еў са стала [Давіда], як адзін з сыноў валадара.
12 Мэфібашэт меў сына малога на імя Міха. І ўсе, што жылі ў доме Цывы, былі слугамі ў
Мэфібашэта.
13 І жыў Мэфібашэт у Ерусаліме, бо ён заўсёды еў са стала валадарскага. А быў ён кульгавы на
абедзьве нагі.

2 Сам 10

1 І сталася пасьля таго, памёр валадар сыноў Амона, і заваладарыў на месцы ягоным Ханун,
сын ягоны.
2 І сказаў Давід: «Зьяўлю міласэрнасьць Хануну, сыну Нахаша, як зьявіў мне міласэрнасьць
бацька ягоны». І паслаў Давід слугаў сваіх, каб пацешыць яго дзеля сьмерці бацькі. І слугі
Давіда прыйшлі ў зямлю сыноў Амона.
3 І сказалі князі сыноў Амона Хануну, гаспадару свайму: «Ці Давід так шануе бацьку твайго ў
вачах тваіх, што ён прыслаў да цябе суцяшальнікаў? Ці ня дзеля таго, каб высачыць, і выведаць
горад, і [пасьля] зруйнаваць яго, паслаў Давід слугаў сваіх да цябе?»
4 І схапіў Ханун слугаў Давіда, і абгаліў палову барады іхняй, і абрэзаў адзеньне іхняе
напалову, аж да азадкаў, і выправіў іх.
5 І паведамілі Давіду, і ён паслаў насустрач ім, бо яны былі вельмі асаромленыя. І сказаў
валадар: «Застаньцеся ў Ерыхоне, пакуль адрастуць бароды вашыя, і тады вернецеся».
6 І ўбачылі сыны Амона, што сталіся яны ненавіснымі Давіду, і паслалі сыны Амона, і нанялі
Сірыйцаў з Бэт-Рэхова і Сірыйцаў з Цовы, дваццаць тысячаў пяхотнікаў, і тысячу ваяроў ад
валадара Маахі, і з Тову дванаццаць тысячаў чалавек.
7 І пачуў [пра гэта] Давід, і паслаў Ёава з усім войскам волатаў.
8 І выйшлі сыны Амона, і сталі ў шыхт перад уваходам у браму. А Сірыйцы з Цовы і Рэхову і
людзі з Тову і Маахі асобна [стаялі] ў полі.
9 І ўбачыў Ёаў, што войскі супраць яго сьпераду і ззаду, і выбраў сабе выбранцоў Ізраіля, і
паставіў іх у шыхты супраць Сірыйцаў.
10 А рэшту людзей даручыў у руку брату свайму Абішаю, які стаў у шыхце супраць сыноў
Амона.
11 І сказаў [Ёаў]: «Калі Сірыйцы будуць мацнейшыя ад мяне, ты прыйдзеш мне на дапамогу.
А калі сыны Амона будуць мацнейшыя ад цябе, я прыйду на дапамогу табе.
12 Будзь мужны, і будзем змагацца за народ наш і за гарады Бога нашага. Няхай ГОСПАД
зробіць тое, што добрае ў вачах Ягоных».
13 І Ёаў і войска, якое з ім, пайшлі ў бой супраць Сірыйцаў, і тыя ўцяклі перад імі.

14 А сыны Амона ўбачылі, што Сірыйцы ўцяклі, і ўцяклі перад Абішаем, і ўвайшлі ў горад. І
адыйшоў Ёаў ад сыноў Амона, і вярнуўся ў Ерусалім.
15 А Сірыйцы ўбачылі, што яны пабітыя Ізраільцянамі, і сабраліся разам.
16 І паслаў Гададэзэр, і прывёў Сірыйцаў, якія на другім баку ракі, і прыйшлі яны ў Хэлям. І
Шабах, начальнік войска Гададэзэра, быў на чале іх.
17 І паведамілі [пра гэта] Давіду, і ён сабраў усяго Ізраіля, і пераправіўся праз Ярдан, і прыйшоў
у Хэлям. І Сірыйцы сталі ў шыхт супраць Давіда, і ваявалі з ім.
18 І ўцяклі Сірыйцы перад абліччам Ізраіля, і Давід выбіў у Сірыйцаў семсот калясьніцаў і сорак
тысячаў вершнікаў. І забіў ён Шабаха, начальніка войска, і ён памёр там.
19 І ўбачылі ўсе валадары, слугі Гададэзэра, што яны пераможаныя Ізраілем, і заключылі мір
з Ізраілем, і служылі яму. І баяліся Сірыйцы дапамагаць сынам Амона.

2 Сам 11

1 І сталася праз год, у час, калі валадары выходзяць [на войны], Давід выправіў Ёава і слугаў
сваіх з ім, і ўсяго Ізраіля, і яны спустошылі сыноў Амона і абляглі Раббу. А Давід застаўся ў
Ерусаліме.
2 І сталася вечарам, што Давід падняўся з ложку свайго і шпацыраваў на даху дома
валадарскага. І ўбачыў ён з даху жанчыну, якая мылася, а жанчына была вельмі прыгожая.
3 І валадар паслаў выведаць, што гэта за жанчына. І сказалі яму, што гэта Батшэва, дачка
Эліяма, жонка Урыі Хета.
4 І паслаў Давід пасланцоў, і ўзяў яе. І яна пайшла да яго, і ён спаў з ёю. І яна ачысьцілася ад
нячыстасьці сваёй, і вярнулася ў дом свой.
5 І зачала тая жанчына, і паслала яна, і паведаміла валадару, і сказала: «Я цяжарная».
6 І паслаў Давід да Ёава: «Пашлі да мяне Урыю Хета». І паслаў Ёаў Урыю Хета да Давіда.
7 І прыйшоў Урыя да [Давіда], і Давід спытаўся пра справы Ёава і народу, і пра падзеі вайны.
8 І сказаў Давід Урыі: «Ідзі ў дом свой, і памый ногі твае». І выйшаў Урыя з дому валадарскага,
а за ім панесьлі яму стравы ад валадара.
9 Але Урыя лёг спаць пры дзьвярах дому валадара з усімі слугамі гаспадара свайго і не пайшоў
у дом свой.
10 І паведамілі Давіду, кажучы: «Урыя не пайшоў у дом свой». І сказаў Давід Урыі: «Ці ж ты не
прыйшоў з дарогі? Чаму ж не заходзіш у дом твой?»
11 І сказаў Урыя Давіду: «Каўчэг, Ізраіль і Юда жывуць у буданах, і гаспадар мой Ёаў, і слугі
гаспадара майго разлажыліся табарам на абліччы поля, а я пайду ў дом свой есьці і піць, і
спаць з жонкай? Як жывы ты і як жывая душа твая, гэтага я не зраблю»
12 І сказаў Давід Урыі: «Застанься тут сёньня, а заўтра я адпушчу цябе». І застаўся Урыя ў
Ерусаліме на той дзень, і на другі.
13 І паклікаў яго Давід, і ён еў перад абліччам ягоным, і піў, і напаіў яго. І выйшаў ён увечары,
і спаў на посьцілцы сваёй між слугаў гаспадара свайго, а ў дом свой не пайшоў.
14 І раніцаю напісаў Давід ліст да Ёава, і паслаў праз Урыю.
15 А ў лісьце ён напісаў, кажучы: «Пастаўце Урыю там, дзе будзе найцяжэйшы бой, і
адыйдзіцеся ад яго, каб быў ён паранены і загінуў».
16 І Ёаў агледзеў горад, і паставіў Урыю ў месцы, пра якое ведаў, што там ваяры адважныя.
17 І выйшлі з гораду людзі, і ваявалі супраць Ёава. І былі забітыя ў народзе слугі Давіда, і загінуў
таксама Урыя Хет.
18 І паслаў Ёаў паведаміць Давіду ўсе падзеі бою гэтага.
19 І загадаў ён весьніку, кажучы: «Калі ты скончыш расказваць валадару пра ўсе падзеі бою
гэтага,
20 і ўбачыш, што валадар разгневаўся, і ён скажа табе: “Чаму вы так блізка пад горад
падыходзілі ваяваць? Ці вы ня ведалі, што з мураў будуць страляць у вас?

21 Хто забіў Абімэлеха, сына Еруббаала? Ці ж не жанчына, якая скінула на яго з муру камень
млынавы, і ён памёр у Тэбэцы? Чаму вы падыходзілі пад мур?” І ты скажы: “Слуга твой Урыя
Хет згінуў таксама”».
22 І пайшоў пасланец, і прыйшоў, і паведаміў Давіду ўсё, з чым паслаў яго Ёаў.
23 І сказаў пасланец Давіду: «Яны мелі перавагу над намі, і яны выйшлі супраць нас у поле,
але мы змагаліся з імі аж да брамы [гораду].
24 І лучнікі стралялі ў слугаў тваіх стрэламі з муру, і загінулі слугі валадара, і слуга твой Урыя
Хет загінуў таксама».
25 І сказаў Давід пасланцу: «Так скажы Ёаву: “Няхай ня будзе ў вачах тваіх тое, што сталася,
бо меч дасягае раз таго, другі раз іншага. Будзь мужны ў вайне супраць гораду і зьнішчы яго”.
І ты падбадзёр яго».
26 І пачула жонка Урыі, што загінуў Урыя, муж ейны, і плакала па чалавеку сваім.
27 Пасьля заканчэньня жалобы паслаў Давід, і ўзяў яе ў дом свой, і сталася яна жонкай ягонай,
і нарадзіла яму сына. Але была кепскай у вачах ГОСПАДА справа гэтая, якую ўчыніў Давід.

2 Сам 12

1 І паслаў ГОСПАД Натана да Давіда, і ён прыйшоў да яго, і сказаў яму: «У адным горадзе жылі
два чалавекі, адзін быў багаты, а другі — бедны.
2 Багаты меў вельмі шмат авечак і валоў.
3 А бедны ня меў нічога, апрача адной малой авечачкі, якую купіў. Ён карміў яе, і яна расла
пры ім разам з дзецьмі ягонымі, і ела пасілак ягоны, і піла з кубка ягонага, і спала каля яго, і
была яму быццам дачка.
4 І прыйшоў госьць да чалавека багатага, але яму было шкада браць авечак сваіх і валоў сваіх,
каб прыгатаваць ежу падарожніку, які прыйшоў да яго. І ўзяў ён авечку беднага чалавека, і
прыгатаваў страву чалавеку, які прыйшоў да яго».
5 І Давід запалаў гневам на чалавека таго, і сказаў Натану: «Як жывы ГОСПАД, варты сьмерці
той чалавек, які так зрабіў.
6 А за авечку няхай аднагародзіцца ў чатыры разы за тое, што так зрабіў і што не пашкадаваў
яго».
7 І сказаў Натан Давіду: «Ты — той чалавек! Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я памазаў цябе
на валадара над Ізраілем і Я выратаваў цябе з рукі Саўла,
8 і даў табе дом гаспадара твайго і жонак гаспадара твайго на ўлоньне тваё, і аддаў табе дом
Ізраіля і Юды, а калі яшчэ гэтага табе замала, дадаў бы табе яшчэ болей.
9 Дык чаму ты пагардзіў словам ГОСПАДА, робячы тое, што ліхое ў вачах Ягоных? Урыю Хета
ты забіў мячом, а жонку ягоную ўзяў сабе за жонку. Ты забіў [Урыю] мячом сыноў Амона.
10 І цяпер меч не адступіць ад дому твайго на вякі за тое, што ты пагардзіў Мною і ўзяў жонку
Урыі Хета, каб была жонкай тваёй”.
11 Гэта кажа ГОСПАД: “Вось, Я навяду на цябе бяду, якая [выйдзе] з дому твайго, і вазьму жонак
тваіх на вачах тваіх, і аддам іх бліжняму твайму, і будзе ён спаць з жонкамі тваімі на вачах
сонца гэтага.
12 Бо ты зрабіў тое патаемна, а Я зраблю гэта перад усім Ізраілем і перад сонцам».
13 І сказаў Давід Натану: «Саграшыў я перад ГОСПАДАМ!» І сказаў Натан Давіду: «ГОСПАД
зьняў з цябе грэх, ты не памрэш.
14 Але як ты праз [грэх свой] пагрэбаваў зьнявагамі ворагаў ГОСПАДА, сын, які народзіцца ў
цябе, памрэ».
15 І Натан пайшоў у дом свой, а ГОСПАД дакрануўся дзіцяці, якога нарадзіла жонка Урыі Давіду,
і яно захварэла.
16 І прасіў Давід Бога за хлопчыка, і посьціў Давід пастом, і прыйшоў [у Дом Божы], і начаваў
[там], і ляжаў на зямлі.
17 І сталі старшыні дому ягонага над ім, каб падняць яго з зямлі, але ён не хацеў, і ня еў хлеб
з імі.

18 І сталася ў сёмы дзень, што памерла дзіцятка, і слугі Давіда баяліся паведаміць яму, што
дзіця памерла, бо гаварылі яны: «Калі яшчэ дзіця жыло, гаварылі мы да яго, але ён не хацеў
слухаць голасу нашага. А цяпер як можам сказаць: “Дзіця памерла”. Можа зрабіць ён [сабе]
нешта благое».
19 І ўбачыў Давід, што слугі ягоныя шэпчуцца між сабою, і зразумеў Давід, што дзіця памерла.
І сказаў Давід слугам сваім: «Ці памерла дзіця?» І яны сказалі: «Памерла».
20 І падняўся Давід з зямлі, і памыўся, і намасьціўся, і зьмяніў адзеньне сваё, і ўвайшоў у Дом
ГОСПАДА, і пакланіўся. І вярнуўся ў дом свой, і папрасіў, каб далі яму хлеб, і еў.
21 І сказалі яму слугі ягоныя: «Чаму гэта робіш? Пакуль яшчэ дзіця жыло, ты посьціў і плакаў,
а калі дзіця памерла, ты ўстаў і ясі хлеб?»
22 І сказаў [Давід]: «Пакуль дзіця жыло, я посьціў і плакаў, бо я казаў сабе: “Хто ведае, можа,
ГОСПАД зьлітуецца, і дзіця будзе жыць?”
23 А цяпер [дзіця] памерла.Навошта маю посьціць? Ці ж я змагу яго вярнуць? Я пайду да яго,
але яно да мяне ня вернецца».
24 І суцяшаў Давід жонку сваю Батшэву, і ўвайшоў да яе, і спаў з ёю. І яна нарадзіла яму сына,
і ён даў яму імя Салямон. І ГОСПАД палюбіў яго,
25 і паслаў да яго, і праз прарока Натана даў яму імя Едыдыя паводле загаду ГОСПАДА.
26 А Ёаў ваяваў супраць Раббы сыноў Амона, і здабыў горад валадарства.
27 І паслаў Ёаў пасланцоў да Давіда, і сказаў: «Я ваяваў супраць Раббы і здабыў Горад водаў.
28 І цяпер ты зьбяры рэшту народу, і стань аблогаю вакол гораду, і здабудзь яго, бо калі я
здабуду горад, ці ж ня імем маім будзе ён названы?»
29 І Давід сабраў увесь народ, і пайшоў на Раббу, і ваяваў супраць яе, і здабыў яе.
30 І ўзяў ён дыядэму з галавы Мількома, вага ейная — талент золата, і камень каштоўны [на
ёй], і была яна на галаве Давіда. І вынес ён з гораду вельмі вялікую здабычу.
31 А народ, які ў ім, ён вывеў і паклаў пад пілы, ламы жалезныя і сякеры жалезныя, і вывеў іх
у печы цагельныя. Так учыніў ён з усімі гарадамі сыноў Амона. І вярнуўся Давід і ўвесь народ
у Ерусалім.

2 Сам 13

1 І сталася пасьля таго. Абсалом, сын Давіда, меў прыгожую сястру імем Тамар. І закахаўся ў
яе Амнон, сын Давіда.
2 І так мучыўся гэтым Амнон, што аж захварэў з прычыны сястры сваёй Тамар. А была яна
[яшчэ] дзяўчынай, і было цяжкім у вачах Амнона зрабіць штосьці з ёю.
3 І меў Амнон сябра імем Ёнадаў, сына Шаммы, брата Давіда. Ёнадаў быў чалавек вельмі хітры.
4 І ён сказаў яму: «Чаму ты худнееш з вечару да вечару, сыне валадара? Ці не паведаміш мне
[пра гэта]?» І Амнон сказаў яму: «Я кахаю Тамар, сястру Абсалома, брата майго».
5 І сказаў яму Ёнадаў: «Ляж у ложак і ўдавай хворага. І прыйдзе бацька твой адведаць цябе, і
ты скажы яму: “Няхай прыйдзе, прашу, сястра мая Тамар і пакорміць мяне хлебам, і на вачах
маіх зробіць пасілак, каб я бачыў гэта і еў з рук ейных”».
6 І Амнон лёг, і ўдаваў хворага. І прыйшоў валадар, каб адведаць яго, і Амнон сказаў валадару:
«Няхай прыйдзе, прашу, Тамар, сястра мая, і няхай на вачах маіх сьпячэ дзьве аладкі, і я
прыйму ежу з рук ейных».
7 І паслаў Давід у дом да Тамар, кажучы: «Схадзі, калі ласка, у дом Амнона, брата твайго, і
сьпячы яму аладкі».
8 І пайшла Тамар у дом брата свайго Амнона, а ён ляжаў. І ўзяла яна цеста, і замясіла, і зрабіла
аладкі на вачах ягоных, і сьпякла аладкі.
9 І ўзяла яна патэльню, і выклала перад ім, але ён не хацеў есьці. І сказаў Амнон: «Няхай усе
выйдуць ад мяне». І ўсе людзі выйшлі ад яго.
10 І Амнон сказаў Тамар: «Прынясі пасілак у спальню, і я зьем яго з рукі тваёй». І ўзяла Тамар
аладкі, што зрабіла, і прынесла Амнону, брату свайму, у спальню.
11 І дала яму, каб ён еў, але ён схапіў яе і сказаў: «Хадзі, ляж са мною, сястра мая».

12 Яна сказала яму: «Не, брат мой, ня гвалць мяне, бо так у Ізраілі ня робіцца. Не рабі гэтай
дурасьці.
13 Куды я дзенуся са зьнявагай сваёй? А ты станеш адным з мярзотнікаў у Ізраілі! Ты пагавары,
калі ласка, з валадаром, бо ён не адмовіць [даць] мяне табе».
14 Але ён не хацеў слухаць голасу яе. І быў ён мацнейшы за яе, і апаганіў яе, і ляжаў з ёю.
15 І зьненавідзеў яе Амнон нянавісьцю вялікай, і нянавісьць гэтая была большай, чым
каханьне, якім кахаў яе. І сказаў ёй Амнон: «Уставай і ідзі [адсюль]».
16 Яна сказала яму: «Не рабі, выганяючы ад сябе, мне яшчэ большай крыўды ад той, якую мне
зрабіў». Але ён не хацеў слухаць яе.
17 І паклікаў прыдзьверніка, які паслугаваў яму, і сказаў: «Выгані яе ад мяне на вуліцу і зачыні
за ёю дзьверы».
18 Яна была апранутая ў сукню доўгую, бо так апраналіся дочкі валадарскія, дзяўчыны. І вывеў
яе паслугач на вуліцу, і замкнуў за ёю дзьверы.
19 І Тамар пасыпала сабе галаву попелам, разадрала сукню сваю доўгую, палажыла рукі на
галаву сваю, і пайшла, і галасіла.
20 І сказаў ёй Абсалом, брат ейны: «Ці Амнон, брат твой, быў з табою? Цяпер сястра мая,
супакойся, бо ён — брат твой. Не бяры гэтага да сэрца свайго». І засталася збалелая Тамар у
доме Абсалома, брата свайго.
21 І пачуў пра ўсё гэта валадар Давід, і вельмі ўзлаваўся.
22 А Абсалом не гаварыў Амнону ані добрага, ані ліхога, бо зьненавідзеў Абсалом Амнона за
тое, што ён зьняважыў Тамар, сястру ягоную.
23 І сталася праз два гады, што Абсалом стрыг [авечак] у Баал-Хацоры, недалёка Эфраіма, і
запрасіў Абсалом усіх сыноў валадара.
24 І прыйшоў Абсалом да валадара, і сказаў: «Вось, стрыгуць [авечак] у слугі твайго. Няхай
прыйдзе валадар са слугамі сваімі да слугі свайго».
25 І сказаў валадар Абсалому: «Не, сыне мой, ня прыйдзем мы ўсе да цябе і ня будзем
абцяжарваць цябе». І ён вельмі прасіў яго, а той не хацеў ісьці, але дабраславіў яго.
26 І сказаў Абсалом: «Калі ня [прыйдзеш], няхай прыйдзе, прашу, Амнон, брат мой». І сказаў
яму валадар: «Навошта ён меў бы ісьці да цябе?»
27 Але Абсалом вельмі прасіў яго, і ён паслаў з ім Амнона і ўсіх сыноў валадарскіх.
28 І загадаў Абсалом слугам сваім, кажучы: «Глядзіце, калі сэрца Амнона павесялее ад віна, я
скажу вам: “Ударце Амнона”, і вы забіце яго! Ня бойцеся, бо гэта я загадваю вам. Набярыцеся
сілы і будзьце адважнымі».
29 І зрабілі юнакі Абсалома Амнону так, як ім загадаў Абсалом. А ўсе сыны валадара ўскочылі,
і сеў кожны на мула свайго, і ўцяклі.
30 А калі яны былі яшчэ ў дарозе, дайшла да Давіда вестка, кажучы: «Абсалом забіў усіх сыноў
валадара, і не пакінуў з іх аніводнага».
31 І ўстаў валадар, і разьдзёр адзеньне сваё, і ўпаў на зямлю, і ўсе слугі ягоныя, якія стаялі
[там], разьдзёрлі адзеньне сваё.
32 І адказаў Ёнадаў, сын Шаммы, брата Давіда, і сказаў: «Няхай ня кажа гаспадар мой, што ўсе
юнакі, сыны валадара, забітыя. Толькі Амнон забіты, бо ў Абсалома на вуснах быў намер гэты
з таго дня, як [Амнон] зьняважыў Тамар, сястру ягоную.
33 І цяпер няхай не бярэ сабе гаспадар мой, валадар, гэтага да сэрца свайго, кажучы, што ўсе
сыны валадара загінулі. Бо загінуў толькі Амнон.
34 А Абсалом уцёк». А юнак, які вартаваў, узьняў вочы свае, і ўбачыў, і вось, мноства [людзей],
якія зыходзяць па схілу гары.
35 І сказаў Ёнадаў валадару: «Вось, ідуць сыны валадара! Так сталася, як слуга твой гаварыў».
36 І калі скончыў ён гаварыць, вось, прышлі сыны валадара, і яны ўзьнялі голас свой, і плакалі.
Таксама валадар і ўсе слугі ягоныя плакалі плачам вельмі вялікім.
37 А Абсалом уцёк і пайшоў да Тальмая, сына Аміхуда, валадара Гешуру. І [Давід] быў у жалобе
па сыне сваім усе дні.

38 А Абсалом уцёк і пайшоў у Гешур, і быў там тры гады.
39 І перастаў валадар Давід гневацца на Абсалома, бо ўжо супакоіўся пасьля сьмерці Амнона.

2 Сам 14

1 І зразумеў Ёаў, сын Цэруі, што сэрца валадара [прыхілілася] да Абсалома.
2 І паслаў Ёаў у Тэкоа, і прывёў адтуль мудрую жанчыну, і сказаў ёй: «Удай, што ты ў жалобе і апраніся ў адзеньне жалобнае, і не намашчайся алеем, і будзеш як жанчына, якая шмат дзён у жалобе па памерлым.
3 І пойдзеш ты да валадара, і скажаш яму словы гэтыя». І ўлажыў Ёаў словы ў вусны ейныя.
4 І казала жанчына з Тэкоа валадару, і ўпала на аблічча сваё, і пакланілася [яму], і сказала: «Дапамажы, валадару».
5 І сказаў ёй валадар: «Што табе?» Яна сказала: «Я — удава, а муж мой памёр.
6 І мела служка твая двух сыноў, і яны пасварыліся ў полі, і не было [нікога], хто б іх разьвёў, і адзін ударыў другога, і той памёр.
7 І вось, уся сям'я паднялася супраць служкі тваёй, і сказалі: "Аддай забойцу брата, і мы заб'ем яго за душу брата ягонага, якога ён забіў. І зьнішчым спадкаемцу". І яны затушаць зьнічку маю, каб не засталося па мужу маім ані імя, ані нашчадкаў на абліччы зямлі».
8 І сказаў валадар жанчыне: «Вяртайся ў дом твой, а я загадаю адносна цябе».
9 І жанчына з Тэкоа сказала валадару: «На мне, гаспадару мой, валадар, віна і на доме бацькі майго, а валадар і пасад ягоны не вінаваты».
10 І сказаў валадар: «Калі хто будзе гаварыць супраць цябе, прывядзі яго да мяне, і ён ужо ня будзе чапляцца да цябе».
11 І сказала яна: «Узгадай, валадару, на ГОСПАДА, Бога твайго, каб мсьціўца за кроў не павялічваў зьнішчэньне і каб не загубілі яны сына майго». Ён сказаў: «Як жывы ГОСПАД, не спадзе нават волас [з галавы] сына твайго на зямлю».
12 І сказала жанчына: «Ці можа служка твая прамовіць да гаспадара майго, валадара, слова?» Ён сказаў: «Кажы».
13 І сказала жанчына: «Чаму ты так думаеш [рабіць] супраць народу Божага? Бо калі валадар сказаў слова гэтае, ён абвінаваціў сябе, бо валадар не вяртае выгнанца свайго.
14 Бо сьмерцю мы памром, і мы быццам вада, разьлітая на зямлі, якую немагчыма сабраць. Але Бог ня [хоча] загубіць душу, і Ён думае, каб ня быў на выгнаньні выгнанец.
15 І вось, я прыйшла сказаць гаспадару майму, валадару, слова гэтае, бо гэты народ палохае мяне. І сказала служка твая: "Скажу я валадару, можа, ён выканае слова служкі сваёй.
16 І выслухае валадар, каб вызваліць служку сваю з рукі таго, хто хоча зьнішчыць мяне і сына майго і [пазбавіць] спадчыны Божай".
17 І сказала служка твая: "Няхай слова гаспадара майго, валадара, суцешыць мяне. Як анёл Божы гаспадар мой, валадар, які выслухае тое, што добрае, і тое, што ліхое". Няхай ГОСПАД, Бог твой, будзе з табою!»
18 І адказаў валадар, і сказаў жанчыне: «Не хавай ад мяне таго, пра што я цябе спытаю». І сказала жанчына: «Гавары, гаспадару мой, валадар».
19 І сказаў валадар: «Ці не рука Ёава з табой у-ва ўсіх гэтых [словах]?» І адказала жанчына, і сказала: «Як жывая душа твая, гаспадару мой, валадар! Нельга [ўхіліцца] ані ўправа, ані ўлева ад усяго, пра што кажа гаспадар мой, валадар. Бо слуга твой Ёаў загадаў мне, і ён улажыў у вусны служкі тваёй усе словы гэтыя.
20 Каб прыповесьцю зьмяніць выгляд гэтай справе, слуга твой Ёаў зрабіў гэта, але гаспадар мой мудры, як мудры анёл Божы, каб ведаць усё, што [адбываецца] на зямлі».
21 І сказаў валадар Ёаву: «Вось, калі ласка, зрабі гэтую справу, і ідзі, і прывядзі юнака Абсалома».
22 І Ёаў упаў на аблічча сваё на зямлю, і пакланіўся, і дабраславіў валадара, і сказаў Ёаў: «Сёньня даведаўся слуга твой, што я знайшоў ласку ў вачах тваіх, гаспадару мой, валадар, бо выканаў ты слова слугі твайго».

23 І ўстаў Ёаў, і пайшоў у Гешур, і прывёў Абсалома ў Ерусалім.
24 І сказаў валадар: «Няхай вернецца Абсалом у дом свой, але аблічча майго ён ня ўбачыць». І вярнуўся Абсалом у дом свой, але аблічча валадара ня ўбачыў.
25 А прыгажэйшага ад Абсалома не было нікога ў-ва ўсім Ізраілі, які так быў слаўны. Ад ног да галавы не было ў ім заганы.
26 А калі стрыг ён галаву сваю, а стрыг ён яе звычайна штогод, бо [валасы] былі цяжкія, і мусіў стрыгчыся, валасы галавы ягонай важылі дзьвесьце сыкляў вагі валадарскай.
27 І нарадзілася Абсалому тры сыны і адна дачка, на імя Тамар. І была яна вельмі прыгожая.
28 І сядзеў Абсалом у Ерусаліме два гады, але аблічча валадара ня бачыў.
29 І паслаў Абсалом да Ёава, каб паслаў яго да валадара, але ён не хацеў прыйсьці да яго. І паслаў ён другі раз, але той не хацеў прыйсьці.
30 І сказаў ён слугам сваім: «Паглядзіце на поле, якое мае Ёаў побач з маім, і [расьце] на ім ячмень. Ідзіце і спаліце яго агнём». І слугі Абсалома спалілі поле агнём.
31 І ўстаў Ёаў, і прыйшоў у дом Абсалома, і сказаў: «Чаму слугі твае спалілі поле маё агнём?»
32 І сказаў Абсалом Ёаву: «Вось, я пасылаў да цябе, кажучы: “Прыйдзі сюды, і я пашлю цябе да валадара, кажучы яму: "Навошта я вярнуўся з Гешуру? Лепш было мне там [жыць]"”. І цяпер [дапамажы]мне ўбачыць аблічча валадара. Калі я ў чым вінаваты, няхай ён заб’е мяне».
33 І пайшоў Ёаў да валадара, і паведаміў яму гэта. І паклікаў ён Абсалома, і той прыйшоў да валадара, і ўпаў на аблічча сваё на зямлю перад абліччам валадара. І пацалаваў валадар Абсалома.

2 Сам 15

1 І сталася пасьля гэтага, што Абсалом справіў сабе калясьніцу і коней, і пяцьдзясят мужчынаў, беглі перад абліччам ягоным.
2 І ўставаў Абсалом рана, і станавіўся каля дарогі пры браме. І кожнага, хто з нейкай справай судовай зьвяртаўся да валадара на суд, клікаў Абсалом да сябе і казаў: «З якога ты гораду?» Той казаў: «Слуга твой з такога і такога калена Ізраіля».
3 І Абсалом казаў яму: «Глядзі, справа твая добрая і слушная, але ў валадара ты ня знойдзеш нікога, хто б цябе выслухаў».
4 І казаў Абсалом: «Калі б хто мяне паставіў судзьдзёю над зямлёй? Тады прыходзілі б да мяне ўсе, што маюць спрэчку або справу судовую, і я паводле праведнасьці [судзіў бы іх]».
5 І калі падыходзіў чалавек, каб пакланіцца яму, ён працягваў руку, і абдымаў яго, і цалаваў яго.
6 І рабіў Абсалом так з кожным Ізраільцянінам, які прыходзіў на суд да валадара, і здабываў Абсалом сэрцы Ізраільцянаў.
7 Праз чатыры гады сказаў Абсалом валадару: «Пайду я ў Хеўрон і споўню шлюбаваньне маё, якое я абяцаў ГОСПАДУ.
8 Бо калі слуга твой быў у Гешуры Сірыйскім, я шлюбаваў, кажучы: “Калі верне мяне ГОСПАД назад у Ерусалім, буду служыць ГОСПАДУ”».
9 І сказаў яму валадар: «Ідзі ў супакоі». І той устаў, і пайшоў у Хеўрон.
10 І паслаў Абсалом таемных весьнікаў у-ва ўсе калены Ізраіля, кажучы: «Калі пачуеце гук рогу, гаманіце: “Абсалом [абраны] валадаром у Хеўроне”».
11 І з Абсаломам выйшлі з Ерусаліму дзьвесьце чалавек, і пайшлі ў шчырасьці [сэрца], ня ведалі нічога.
12 І паслаў Абсалом у час складаньня ахвяраў, і паклікаў Ахітафэля з Гіло, дарадцу Давіда, з гораду ягонага Гіло. І ўмацавалася змова, і народ зыходзіўся і павялічваўся вакол Абсалома.
13 І прыйшоў весьнік да Давіда, кажучы: «Сэрца ўсяго Ізраіля з Абсаломам».
14 І сказаў Давід усім слугам, якія [былі] з ім у Ерусаліме: «Уставайце! Уцякайма! Бо ня будзе нам ратунку перад абліччам Абсалома. Сьпяшайцеся ўцячы, каб не дагнаў ён нас раптам і каб ня выгубіў нас, і каб вострывам мяча ня зьнішчыў гораду».

15 І слугі валадара сказалі валадару: «Усё, што вырашыць гаспадар наш, валадар, вось, мы,
слугі твае, [выканаем]».
16 І выйшаў валадар, і ўвесь дом ягоны нагамі сваімі, і пакінуў валадар дзесяць жанчынаў
наложніцаў сьцерагчы дом.
17 І выйшаў валадар, і ўвесь народ нагамі сваімі, і затрымаліся яны пры апошнім доме.
18 І праходзілі пад рукою ягонай усе слугі ягоныя, усе Керэты, усе Пэлеты і ўсе тыя, якія
прыйшлі з Гату, шэсьцьсот чалавек, якія нагамі сваімі прыйшлі з Гату перад аблічча валадара.
19 І сказаў валадар Іттаю з Гату: «Навошта ты ідзеш разам з намі? Вярніся і застанься з
валадаром, бо ты — чужынец і выгнанец з бацькаўшчыны тваёй.
20 Учора прыйшоў ты, а сёньня я змушаю цябе ісьці блукаць разам з намі, і я сам ня ведаю,
куды іду. Вярніся і забяры братоў тваіх, і міласэрнасьць і праўда [няхай будуць] з табой».
21 І адказаў Іттай валадару, і сказаў: «Як жывы ГОСПАД і як жывы гаспадар мой, валадар!
Толькі там, дзе будзе гаспадар мой, валадар, на сьмерць ці на жыцьцё, там будзе і слуга твой».
22 І сказаў Давід Іттаю: «Ідзі і праходзь!» І перайшоў [Кедрон] Іттай з Гату і ўсе людзі ягоныя,
і ўсе дзеці ягоныя, якія з ім.
23 А ўся зямля плакала голасам вялікім, і ўвесь народ пераходзіў [Кедрон], і валадар перайшоў
ручай Кедрон, і ўвесь народ накіраваўся па дарозе ў пустыню.
24 І вось, Цадок, і з ім усе лявіты, несучы Каўчэг Запавету Божага. І паставілі яны Каўчэг Божы,
і Абіятар стаяў, пакуль увесь народ ня выйшаў з гораду.
25 І сказаў валадар Цадоку: «Занясіце Каўчэг Божы ў горад. Калі я знайду ласку ў вачах
ГОСПАДА, Ён верне мяне, і я ўбачу Яго і жытло Ягонае.
26 А калі Ён скажа: “Ня маю ўпадабаньня ў табе”, вось я, няхай Ён робіць, што добрае ў вачах
Ягоных».
27 І сказаў валадар Цадоку сьвятару: «Ці ж ты не відушчы? Вяртайся ў горад у супакоі. Ахімаац,
сын твой, і Ёнатан, сын Абіятара, абодва сыны вашыя [застануцца] з вамі.
28 Вось, я буду чакаць на раўнінах пустыні, пакуль ня прыйдзе да мяне слова ад вас, якое вы
паведаміце мне».
29 І вярнулі Цадок і Абіятар Каўчэг Божы ў Ерусалім, і засталіся там.
30 А Давід узыходзіў на гару Аліўную, узыходзіў і плакаў, галава ягоная была закрытая, і ён
ішоў босы. І ўвесь народ, які [быў] з ім, ішоў з закрытымі галовамі, і ўзыходзілі, і плакалі.
31 І паведамілі Давіду, кажучы: «Ахітафэль у змове з Абсаломам». І сказаў Давід: «ГОСПАДЗЕ,
зрабі неразумнай раду Ахітафэля».
32 І калі Давід узыйшоў на вяршыню [гары], дзе пакланяліся Богу, вось, пераняў яго Хушай
Аркеец у разьдзёртым адзеньні і з [пасыпанай] зямлёй галавой.
33 І сказаў яму Давід: «Калі ты пойдзеш са мною, будзеш для мяне цяжарам.
34 А калі вернешся ў горад і скажаш Абсалому: “Я, валадару, слуга твой. Як раней я быў слугой
бацькі твайго, так цяпер буду слугой тваім!”, і ты ўдарэмніш раду Ахітафэля адносна мяне.
35 там з табою Цадок і Абіятар, сьвятары. І ўсе словы, якія пачуеш у доме валадара, перакажаш
Цадоку і Абіятару, сьвятарам.
36 Вось, з імі два сыны іхнія, Ахімаац у Цадока і Ёнатан у Абіятара. Праз іх перакажаш кожнае
слова, якое пачуеш».
37 І ўвайшоў Хушай, сябра Давіда, у горад. І Абсалом увайшоў у Ерусалім.

2 Сам 16

1 Калі Давід зыйшоў крыху з вяршыні [гары], вось, пераняў яго Цыва, слуга Мэфібашэта, і
два аслы наладаваныя, а на іх дзьвесьце хлябоў і сто зьвязак разынак, і сто сьпелых [фігаў],
і буклак віна.
2 І сказаў валадар Цыве: «Што гэта?» А Цыва сказаў: «Гэтыя аслы — для дому валадара,
каб вазіць, а хлябы і плады — на ежу слугам тваім, а віно — каб піў той, хто зьняможацца ў
пустыні!»

3 І сказаў валадар: «А дзе сын гаспадара твайго?» І сказаў Цыва валадару: «Вось, ён застаўся ў
Ерусаліме, бо сказаў: “Сёньня вяртае мне дом Ізраіля валадарства бацькі майго”».
4 І сказаў валадар Цыве: «Вось, тваё ўсё, што [належала] Мэфібашэту». І сказаў Цыва: «Я
схіляюся! Няхай я знайду ласку ў вачах тваіх, гаспадару мой, валадар».
5 І прыйшоў валадар Давід у Бахурым, і вось, выйшаў адтуль чалавек з роду дома Саўла, а імя
ягонае — Шымэй, сын Гера. Ён ішоў і, ідучы, праклінаў яго,
6 і кідаў камяні ў Давіда і ў-ва ўсіх слугаў валадара Давіда, хоць увесь народ і ўсе волаты ішлі
праваруч валадара і леваруч.
7 І Шымэй казаў так, праклінаючы: «Ідзі, ідзі прэч, чалавек крыважэрны, чалавек Бэліяла!
8 Зьвярнуў на цябе ГОСПАД усю кроў дому Саўла, бо забраў ты валадарства ў яго. І аддаў
ГОСПАД валадарства ў рукі Абсалома, сына твайго. І вось, злыбеды ў цябе, бо ты — чалавек
крыважэрны».
9 І сказаў Абішай, сын Цэруі, валадару: «Чаму праклінае гэты здохлы сабака гаспадара майго,
валадара? Пайду і адсяку галаву ягоную».
10 А валадар сказаў: «Што мне і вам, сыны Цэруі? Калі ён праклінае і калі яму ГОСПАД сказаў,
каб праклінаў Давіда, хто сказажа: “Чаму ты так робіш?”»
11 І сказаў валадар Абішаю і ўсім слугам сваім: «Вось, сын мой, які выйшаў з нутра майго,
цікуе на душу маю, тым больш гэты сын Бэн’яміна. Пакіньце яго, няхай праклінае, бо сказаў
яму ГОСПАД.
12 Можа, ГОСПАД гляне на гора маё і аднагародзіць мне ГОСПАД дабром за праклёны ягоныя ў
гэты дзень».
13 І ішоў Давід і людзі ягоныя па дарозе, а Шымэй ішоў па ўзбоччы гары, праклінаючы, і
кідаючы камяні ў яго, і абсыпаючы пылам.
14 І прыйшоў валадар і ўвесь народ, які з ім, змучаныя, і там адпачылі.
15 А Абсалом і ўвесь народ Ізраіля ўвайшлі ў Ерусалім. І Ахітафэль быў з ім.
16 І прыйшоў Хушай Аркеец, сябра Давіда, да Абсалома, і сказаў Хушай Абсалому: «Няхай жыве
валадар, няхай жыве валадар!»
17 І сказаў Абсалом Хушаю: «Ці такая ласка твая да сябра твайго? Чаму ты не пайшоў з сябрам
тваім?»
18 І сказаў Хушай Абсалому: «Не [пайшоў]! Бо каго выбраў ГОСПАД і гэты народ, і ўвесь Ізраіль,
з тым і я застануся.
19 А да таго, каму я маю служыць? Ці ж ня сыну ягонаму? Як служыў я бацьку твайму, так
буду [служыць] табе».
20 І сказаў Абсалом Ахітафэлю: «Дайце раду, што маем рабіць?»
21 І сказаў Ахітафэль Абсалому: «Увайдзі да наложніцаў бацькі твайго, якіх ён пакінуў
пільнаваць дом, і пачуе ўвесь Ізраіль, што агідны табе бацька твой, і ўмацуюцца рукі ўсіх, хто
з табою».
22 І паставілі намёт Абсалому на даху, і ён на вачах усяго Ізраіля ўвайшоў да наложніцаў бацькі
свайго.
23 А парада Ахітафэля, якую ён даваў, у гэтыя дні была быццам слова Бога. Бо такая была
ўсякая парада Ахітафэля, як для Давіда, так і для Абсалома.

2 Сам 17

1 І сказаў Ахітафэль Абсалому: «Я выбяру сабе дванаццаць тысячаў ваяроў і ўстану, і ў гэтую
ноч пайду на Давіда,
2 і нападу на яго, пакуль ён змучаны і пакуль у яго рукі аслабеўшы, і напалохаю яго. І ўцячэ
ўвесь народ, які з ім, і я заб’ю самога валадара.
3 І я прывяду ўвесь народ да цябе. Як ня будзе [жыць] толькі адзін чалавек, якога ты шукаеш,
тады ўвесь народ будзе [жыць] у супакоі».
4 І слушным было слова гэтае ў вачах Абсалома і ў вачах усіх старшыняў Ізраіля.
5 І сказаў Абсалом: «Паклічце Хушая Аркейца і паслухаем, што [скажуць] вусны ягоныя».

6 І прыйшоў Хушай да Абсалома, і сказаў яму Абсалом, кажучы: «Вось такое слова сказаў
Ахітафэль. Ці маем выканаць слова ягонае, ці не? Ты скажы!»
7 І сказаў Хушай Абсалому: «Нядобрая парада, якую даў табе гэтым разам Ахітафэль».
8 І сказаў Хушай: «Ты ведаеш бацьку твайго і людзей ягоных, што яны волаты і маюць горыч
у душы, як мядзьведзіца ў полі, пазбаўленая дзяцей. А бацька твой — ваяр, і ён ня сьпіць з
людзьмі сваімі.
9 Вось і цяпер ён хаваецца ў нейкай пячоры або ў іншым месцы. І калі хто загіне пры
першым [нападзе] на іх, пачуюць вестку гэтую і скажуць: “Сталася вялікая параза народу,
які з Абсаломам”.
10 І тады спалохаецца адважны, у якога сэрца як сэрца льва, бо ўвесь Ізраіль ведае, які волат
бацька твой і якія адважныя тыя, што з ім.
11 Я раджу, зьбіраючы, сабраць да цябе ўвесь Ізраіль ад Дана да Бээр-Шэвы, шматлікі, як пясок
на беразе мора, і ты сам пойдзеш у бой.
12 І мы прыйдзем да яго ў месца, дзе ён знаходзіцца, і нападзем на яго, як раса падае на зямлю,
і не пакінем тады нікога з усіх людзей, якія з ім.
13 А калі ён будзе сядзець у горадзе, тады ўсе Ізраільцяне прынясуць пад той горад вяроўкі, і
мы сьцягнем яго ў ручай, і не застанецца ад яго нават камяня».
14 І сказалі Абсалом і ўсе Ізраільцяне: «Лепшая парада Хушая Аркейца, чым парада
Ахітафэля». Бо ГОСПАД вырашыў ударэмніць добрую параду Ахітафэля, каб навёў ГОСПАД
на Абсалома няшчасьце.
15 І сказаў Хушай сьвятарам Цадоку і Абіятару: «Такую вось параду даў Ахітафэль Абсалому і
старшыням Ізраіля, а гэткую параду даў я.
16 І цяпер пашліце хутка, і паведаміце Давіду, кажучы: “Не заставайся ў гэтую ноч на раўніне
ў пустыні, але, пераходзячы, перайдзі [Ярдан], каб не загінуў валадар і ўвесь народ, які з ім”».
17 А Ёнатан і Ахімаац стаялі ў Эн-Рагэлі, і прыйшла служка, і паведаміла ім [вестку], і яны
пайшлі, каб паведаміць валадару Давіду, і яны не маглі заходзіць у горад, каб ня бачылі іх.
18 Але ўбачыў іх нейкі юнак і паведаміў Абсалому. І яны абодва хутка пайшлі, і прыйшлі ў дом
нейкага чалавека ў Бахурыме. Ён меў студню на панадворку сваім, і яны спусьціліся ў яе.
19 А жанчына ўзяла і расьцягнула посьцілку над адтулінай студні, і насыпала збожжа на яе, і
ня ведаў [ніхто] пра гэта.
20 І прыйшлі слугі Абсалома ў дом жанчыны, і сказалі: «Дзе Ахімаац і Ёнатан?» І сказала
ім жанчына: «Пайшлі адсюль праз [струмень]». І тыя шукалі іх, і не знайшлі, і вярнуліся ў
Ерусалім.
21 І калі тыя адыйшліся, выйшлі яны са студні, і пайшлі, і паведамілі валадару Давіду:
«Уставайце і перапраўцеся хутка праз раку, бо вось такую параду дае Ахітафэль».
22 І ўстаў Давід, і ўвесь народ, які з ім, і пераправіліся праз Ярдан да сьвітаньня, і не засталося
нікога, хто не пераправіўся праз Ярдан.
23 А Ахітафэль убачыў, што не была выканана парада ягоная, і ён асядлаў асла, і ўстаў, і
вярнуўся ў дом свой у горад свой, і даў загад адносна дому свайго, і павесіўся, і памёр, і быў
пахаваны ў магіле бацькі свайго.
24 І прыйшоў Давід у Маханаім, а Абсалом пераправіўся праз Ярдан, ён і ўсе Ізраільцяне з ім.
25 На месца Ёава Абсалом паставіў [начальнікам] над войскам Амасу. Амаса быў сынам
чалавека, які называўся Етра, Ізмаэлец, які ўвайшоў да Абігайль, дачкі Нахаша, сястры Цэруі,
маці Ёава.
26 І разлажыўся Ізраіль і Абсалом табарам у зямлі Гілеад.
27 І сталася, калі Давід прыйшоў у Маханаім, Шобі, сын Нахаша з Раббы сыноў Амона, і Махір,
сын Аміэля з Лёдэбару, і Барзілай, Гілеадзец з Рагэліму,
28 прынесьлі яму ложак, і посуд, і гаршчкі гліняныя, пшаніцу і ячмень, муку, зерне пражанае,
фасолю, сачэвіцу,
29 мёд, масла, [сыры] авечыя і сыры кароўскія. І прынесьлі гэта Давіду і народу, які з ім, на
ежу, бо казалі: «Народ гэты галодны, змучаны і засьмягшы ў пустыні».

2 Сам 18

1 І палічыў Давід, народ, які з ім, і паставіў над імі тысячнікаў і сотнікаў.
2 І скіраваў Давід траціну людзей сваіх пад руку Ёава, траціну — пад руку Абішая, сына Цэруі,
брата Ёава, і траціну — пад руку Іттая з Гату. І сказаў валадар народу: «Я таксама пайду з вамі».
3 І сказаў народ: «Ты ня пойдзеш, бо калі мы ўцячэм, нас ня возьмуць да сэрца. І калі загіне
палова нас, нас ня возьмуць да сэрца, бо ты [адзін] — як нас дзесяць тысячаў. Дык лепш, калі
ты будзеш дапамагаць нам з гораду».
4 І сказаў ім валадар: «Што добра ў вачах вашых, я зраблю». І стаў валадар у браме, а ўвесь
народ праходзіў сотнямі і тысячамі.
5 І загадаў валадар Ёаву, Абішаю і Іттаю, кажучы: «Лагоднымі [будзьце] з юнаком Абсаломам».
І ўвесь народ чуў загад валадара, [які быў дадзены] ўсім начальнікам адносна Абсалома.
6 І выйшаў народ [Давіда] ў поле супраць Ізраіля, і пачаўся бой у лесе Эфраіма.
7 І там атрымалі паразу Ізраільцяне перад абліччам слугаў Давіда. І была ў той дзень параза
вялікая, і [загінула] дваццаць тысячаў.
8 І бой пашырыўся на ўсю зямлю тую, і лес у той дзень выгубіў народу больш, чым меч.
9 І сутыкнуўся Абсалом са слугамі Давіда, а Абсалом ехаў на муле, і мул пабег пад вялікі і
сукаваты дуб, і Абсалом учапіўся [валасамі] галавы сваёй за [галіны] дуба, і павіс між небам і
зямлёй, а мул, які быў пад ім, пабег далей.
10 І ўбачыў [гэта] нейкі чалавек, і паведаміў Ёаву, і сказаў: «Вось, бачыў я Абсалома, які вісіць
на дубе».
11 І сказаў Ёаў чалавеку, які пра гэта паведаміў яму: «Калі ты бачыў яго, чаму ты не забіў яго
на тым месцы? Я даў бы табе дзесяць срэбнікаў і адзін пояс».
12 А ён сказаў Ёаву: «Нават калі б у далоні мае ты палажыў тысячу срэбнікаў, я ніколі не
падняў бы рукі сваёй на сына валадара. Бо ў вушы нашыя валадар загадаў табе, Абішаю і Іттаю:
“Захавайце мне юнака Абсалома”.
13 І калі б я супраць душы сваёй учыніў падступнасьць, ніякая справа не схаваецца ад валадара,
і ты сам адступішся ад мяне».
14 І сказаў Ёаў: «Не хачу марудзіць з табою». І ўзяў ён у далоні свае тры стралы, і ўбіў іх у сэрца
Абсалома, калі ён яшчэ жывы вісеў на дубе.
15 І падбегла дзесяць юнакоў, збраяносцы Ёава, і ўдарылі Абсалома, і забілі яго.
16 І затрубіў Ёаў у рог, і народ вярнуўся з пагоні за Ізраілем, бо Ёаў стрымаў народ.
17 І яны ўзялі Абсалома, і кінулі яго ў лесе ў вялікую яму, і накідалі на ім вельмі вялікую купу
камянёў. А Ізраільцяне ўцяклі ў намёты свае.
18 Калі яшчэ жыў Абсалом, ён паставіў сабе помнік у даліне валадарскай, бо ён казаў: «Я ня
маю сына, які б захаваў памяць пра імя маё». І назваў ён помнік імем сваім. І да гэтага дня
называецца ён Яд-Абсалом.
19 І сказаў Ахімаац, сын Цадока: «Пабягу і паведамлю валадару, што ГОСПАД зьявіў яму суд,
[вызваляючы] ад рукі ворагаў ягоных».
20 І сказаў яму Ёаў: «Ня будзеш ты ў гэты дзень дабравесьнікам, але паведаміш іншым разам.
Сёньня ты ня будзеш дабравесьнікам, бо сын валадара забіты».
21 І сказаў Ёаў Кушаніну: «Ідзі і паведамі валадару, што ты бачыў». І пакланіўся Кушанін Ёаву,
і пабег.
22 І другі раз Ахімаац, сын Цадока, сказаў Ёаву: «Што б ні было, я таксама пабягу за
Кушанінам!» А Ёаў сказаў: «Чаму ты хочаш бегчы, сын мой, калі няма добрай весткі».
23 [Ён сказаў]: «Што б ні сталася, пабягу». І [Ёаў] сказаў яму: «Бяжы!» І Ахімаац пабег
напрасткі, і апярэдзіў Кушаніна.
24 А Давід сядзеў паміж дзьвюма брамамі, і вартаўнік хадзіў на даху брамы над мурам. І падняў
ён вочы свае, і ўбачыў, і вось, чалавек бяжыць адзін.
25 І крыкнуў вартаўнік, і паведаміў валадару. І валадар сказаў: «Калі адзін, добрая вестка ў
вуснах ягоных». А той бег і набліжаўся.

26 І ўбачыў вартаўнік другога чалавека, які бег, і закрычаў вартаўнік прыдзьверніку, і сказаў:
«Вось, чалавек бяжыць адзін». А валадар сказаў: «Гэта таксама з добрай весткай».
27 І паведаміў вартаўнік: «Я бачу, што хада першага як бег Ахімааца, сына Цадока». І сказаў
валадар: «Ён — чалавек добры, прыходзіць з добрай весткай».
28 І закрычаў Ахімаац, і сказаў валадару: «Мір!» І пакланіўся валадару абліччам да зямлі, і
сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог твой, Які скарыў табе людзей, што паднялі рукі свае на
гаспадара майго, валадара!»
29 І сказаў валадар: «Ці супакой у юнака Абсалома?» І сказаў Ахімаац: «Бачыў я вялікае
замяшаньне, калі слуга валадара Ёаў пасылаў слугу твайго, але ня ведаю, што [было]».
30 І сказаў валадар: «Адыйдзіся і стань там». І той адыйшоў, і стаў.
31 І вось, прыйшоў Кушанін, і сказаў Кушанін: «Добрую вестку прыношу, гаспадару мой,
валадар. Бо адпомсьціў ГОСПАД за цябе, [выбаўляючы] цябе з рук усіх тых, якія збунтаваліся
супраць цябе».
32 І сказаў валадар Кушаніну: «Ці супакойу юнака Абсалома?» І сказаў Кушанін: «Няхай будзе
з ворагамі гаспадара майго, валадара, і з усімі, якія зламысна паўсталі супраць цябе, тое самае,
што з юнаком гэтым».

2 Сам 19

1 І задрыжэў валадар, і пайшоў у верхняе памяшканьне брамы, і плакаў. А калі ішоў, гаварыў:
«Сыне мой, Абсаломе! Абсаломе, сыне мой, сыне мой! Лепш бы я памёр, чым ты! Абсаломе,
сыне мой, сыне мой!»
2 І паведамілі Ёаву: «Вось, валадар плача і ў жалобе дзеля Абсалома».
3 І сталася перамога ў той дзень жалобаю для ўсяго народа, бо народ пачуў у той дзень вестку:
«Валадар сумуе дзеля сына свайго».
4 У той дзень уваходзіў народ у горад цішком, як уваходзяць людзі асаромленыя, якія ўцяклі
з бітвы.
5 А валадар закрыў аблічча сваё, і галасіў валадар моцным голасам: «Сыне мой, Абсаломе!
Абсаломе, сыне мой, сыне мой!»
6 І ўвайшоў Ёаў да валадара ў дом, і сказаў: «Ты асароміў сёньня аблічча ўсіх слугаў тваіх, якія
захавалі душу тваю і душы сыноў тваіх і дачок тваіх, і душы жонак тваіх і наложніцаў тваіх.
7 Ты любіш тых, якія ненавідзяць цябе, і ў нянавісьці маеш тых, што любяць цябе. Ты сёньня
паказаў, што для цябе нішто князі твае і слугі твае. Бо я зразумеў сёньня, што калі б Абсалом
застаўся пры жыцьці, а мы ўсе паўміралі, гэта было б слушным у вачах тваіх.
8 І цяпер падыміся, выйдзі і прагавары да сэрца слугаў тваіх. Прысягаю табе на ГОСПАДА, што
калі ня выйдзеш, ніхто не застанецца ў гэтую ноч пры табе. Гэта будзе горш табе, чым усе
беды, якія прыходзілі на цябе ад маладосьці тваёй аж да цяпер».
9 І ўстаў валадар, і сеў у браме, і ўсяму народу было паведамлена, кажучы: «Вось, валадар
сядзіць у браме». І прыходзіў увесь народ перад аблічча валадара, а Ізраіль уцёк у намёты
свае.
10 І спрачаўся ўвесь народ у-ва ўсіх каленах Ізраіля, кажучы: «Валадар вызваліў нас з рук
ворагаў нашых, і ён вызваліў нас з рук Філістынцаў. І цяпер уцёк з зямлі перад Абсаломам.
11 А Абсалом, якога мы памазалі на валадара, загінуў у баі. Чаму цяпер маўчыце і не вяртаеце
валадара?»
12 І паслаў валадар Давід да Цадока і Абіятара, святароў, кажучы: «Прамаўляйце да старшыняў
Юды, кажучы: “Чаму вы марудзіце, каб вярнуць валадара ў дом ягоны? Слова ўсяго Ізраіля
дайшло ўжо да валадара, у дом ягоны.
13 Вы — браты мае, вы — костка мая і цела маё. Чаму вы марудзіце, каб вярнуць валадара?”
14 А Амасе скажыце: “Ці ты ня костка мая і цела маё? Няхай гэта зробіць мне Бог, і гэта
дадасьць, калі ты ў мяне ня будзеш у-ва ўсе дні начальнікам войска на месцы Ёава”».
15 І прыхіліў ён сэрцы ўсіх людзей Юды, як аднаго чалавека. І паслалі яны да валадара:
«Вярніся ты і ўсе слугі твае».

16 І вярнуўся валадар, і прыйшоў да Ярдану. А Юда прыйшоў у Гільгал, каб прыйсьці на
спатканьне валадару, каб перавесьці яго праз Ярдан.
17 І Шымэй, сын Гера, Бэн'ямінец з Бахурыму, пасьпяшаўся з людзьмі Юды на сустрэчу з
валадаром Давідам.
18 А з ім была тысяча Бэн'ямінцаў і Цыва, слуга дому Саўла, і пятнаццаць сыноў ягоных, і
дваццаць слугаў ягоных з ім. І пераправіліся яны праз Ярдан перад абліччам валадара.
19 І перайшлі яны брод, каб пераправіць дом валадара і зрабіць тое, што добрае ў вачах ягоных.
І Шымэй, сын Гера, упаў [на твар] перад абліччам валадара, калі той меў пераправіцца праз
Ярдан,
20 і сказаў валадару: «Не залічвай віну мне, гаспадару мой, і не памятай на крыўду слугі твайго
ў той дзень, калі гаспадар мой, валадар, выходзіў з Ерусаліму. І не бяры гэтага да сэрца свайго.
21 Бо ведае слуга твой, што я саграшыў, і вось, першы з усяго дому Язэпа выходжу сёньня на
спатканьне гаспадара майго, валадара».
22 І адказаў Абішай, сын Цэруі, і сказаў: «Ці ж ня будзе забіты Шымэй за тое, што праклінаў
памазанца ГОСПАДАВАГА?»
23 Але Давід сказаў: «Што мне і вам, сыны Цэруі, што вы сталіся для мяне сёньня
супраціўнікамі? Сёньня ніхто не павінен паміраць у Ізраілі, бо с ведаю, што сёньня я [зноў
стаўся] валадаром над Ізраілем».
24 І сказаў валадар Шымэю: «Не памрэш!» І запрысягнуў яму валадар.
25 І Мэфібашэт, сын Саўла, выйшаў на спатканьне валадара. Ня мыў ён ногі свае, ня стрыг
барады сваёй і ня мыў адзеньня свайго з таго дня, у які валадар выехаў, і аж да дня, калі
вярнуўся ў супакоі.
26 І калі ён прыйшоў на спатканьне валадара ў Ерусалім, сказаў яму валадар: «Чаму ты не
пайшоў са мною, Мэфібашэт?»
27 Ён сказаў: «Гаспадару мой, валадар, ашукаў мяне слуга мой! Я, слуга твой, сказаў слузе
свайму: "Вазьму сабе асла, сяду на яго і паеду з валадаром", бо кульгавы слуга твой.
28 Але ён ачарніў слугу твайго перад гаспадаром маім, валадаром. Але ты, гаспадару мой,
валадар, як анёл Божы, таму рабі, што добрае ў вачах тваіх.
29 Увесь дом бацькі майго варты быў сьмерці перад гаспадаром маім, валадаром, але ты
пасадзіў слугу твайго між тых, што ядуць са стала твайго. Дык якая праведнасьць мая і пра
што мне крычаць да валадара?»
30 І сказаў яму валадар: «Навошта ты гаворыш словы гэтыя? Я сказаў, каб ты і Цыва падзялілі
поле».
31 І сказаў Мэфібашэт валадару: «Няхай ён бярэ нават усё, калі гаспадар мой, валадар,
вярнуўся ў супакоі ў дом свой!»
32 А Барзілай Гілеадзец прыйшоў з Рагэліму і перайшоў з валадаром праз Ярдан, каб
разьвітацца з ім за Ярданам.
33 Барзілай быў вельмі стары, меў ён восемдзясят гадоў. Ён забясьпечыў валадара, калі ён быў
у Маханаіме, бо быў чалавекам вельмі багатым.
34 І сказаў валадар Барзілаю: «Хадзі са мною, і я забясьпечу цябе ў Ерусаліме».
35 І сказаў Барзілай валадару: «Колькі дзён [будуць яшчэ] гады жыцьця майго, каб ісьці мне з
валадаром у Ерусалім?
36 Маю сёньня восемдзясят гадоў. Ці я адрозьню, што добрае, а што кепскае? Ці будзе
смакаваць слузе твайму ежа і пітво? Ці магу я яшчэ слухаць голас сьпевакоў і сьпявачак?
Навошта слуга твой мае быць цяжарам для гаспадара майго, валадара?
37 Крыху пяройдзе слуга твой з валадаром за Ярдан. Але навошта валадару аднагароджваць
мне такою платаю?
38 Дазволь слузе твайму вярнуцца, каб памерці ў горадзе сваім, побач з магілай бацькі майго
і маці маёй. Але вось, слуга твой, Кімгам, няхай пойдзе з гаспадаром маім, валадаром, і ты
зрабі яму тое, што добра ў вачах тваіх».
39 І сказаў валадар: «Кімгам няхай ідзе са мною, і я зраблю яму, што добра ў вачах тваіх, і ўсё,
пра што будзеш мяне прасіць, я зраблю для яго».

40 І ўвесь народ пераправіўся праз Ярдан, і валадар перайшоў, і пацалаваў валадар Барзілая, і
дабраславіў яго, і ён вярнуўся на месца сваё.
41 І пайшоў валадар у Гільгал, і Кімгам пайшоў з ім. І ўвесь народ Юды перайшоў разам з
валадаром, і таксама палова народу Ізраіля.
42 І вось, прыйшлі да валадара ўсе людзі Ізраіля, і сказалі валадару: «Чаму браты нашыя, сыны
Юды, укралі цябе і пераправілі валадара і дом ягоны праз Ярдан, і ўсіх людзей Давіда разам з
ім?»
43 І адказалі ўсе людзі Юды людзям Ізраіля: «Бо валадар нам бліжэйшы. Чаму вы лічыце гэта
ліхім для вас? Ці мы зьелі што ў валадара? Ці мы забралі [нешта] для сябе?»
44 І адказалі людзі Ізраіля людзям Юды, і сказалі: «Дзесяць рук маіх у валадара, і таму ў Давіда
мы [лепшыя] за вас. Дык чаму вы пагарджаеце намі? Хіба ня мы першыя сказалі слова, каб
вярнуць валадара нашага?» Але слова людзей Юды было мацнейшым, чым слова людзей
Ізраіля.

2 Сам 20

1 І быў там нейкі чалавек Бэліяла на імя Шэва, сын Біхры, Бэн'ямінец. Ён затрубіў у рог і сказаў:
«Ня маем мы часткі з Давідам, ані спадчыны з сынам Есэя! Ізраіль, [ідзі] ў намёты свае!»
2 І ўсе людзі Ізраілю адыйшлі ад Давіда [і пайшлі] за Шэваю, сынам Біхры. А людзі Юды
засталіся пры валадару сваім ад Ярдану аж да Ерусаліму.
3 І прыйшоў валадар у дом свой у Ерусаліме, і ўзяў валадар дзесяць наложніцаў, якіх пакідаў
пільнаваць дом, і памясьціў іх у дом пад вартай, і забясьпечваў іх [усім], але больш да іх не
прыходзіў, і былі яны ўвязьненыя аж да дня сьмерці сваёй, быццам удовы пры жыцьці [мужа].
4 І сказаў валадар Амасе: «Скліч да мяне ўсіх мужчынаў Юды на трэці дзень, а ты стань тут».
5 І пайшоў Амаса, каб склікаць людзей Юды, і замарудзіў на вызначаны час, які быў яму
прызначаны.
6 І сказаў Давід Абішаю: «Цяпер Шэва, сын Біхры, горшы для нас, чым Абсалом. Ты зьбяры
слугаў гаспадара свайго і дагані яго, каб не знайшоў ён сабе гораду ўмацаванага і ня ўцёк
перад вачыма нашымі».
7 І пайшлі з ім людзі Ёава, Керэты, і Пэлеты, і ўсе волаты. І выйшлі яны з Ерусаліму даганяць
Шэву, сына Біхры.
8 Яны былі каля вялікага камяня, які ў Гібэоне, калі выйшаў насустрач ім Амаса. А Ёаў быў
узброены, і на сьцёгнах ягоных на поясе вісеў меч у похвах, які зручна ўваходзіў і выходзіў.
9 І сказаў Ёаў Амасе: «Ці супакой у цябе, браце мой?» І ўзяў Ёаў Амасу правай рукой за бараду,
каб пацалаваць яго.
10 І Амаса не заўважыў мяча ў другой руцэ Ёава, а [Ёаў] ударыў ім у жывот ягоны, і нутро
ягонае вылілася на зямлю, і ўжо не паўтарыў [удару]. І той памёр. А Ёаў і брат ягоны Абішай
перасьледавалі Шэву, сына Біхры.
11 І адзін са слугаў Ёава затрымаўся, і сказаў: «Хто прыхільны Ёаву і хто за Давіда, [няхай ідз з
Ёавам!»
12 А Амаса ляжаў скрываўлены сярод гасьцінца. І ўбачыў той чалавек, што людзі спыняюцца,
і перацягнуў Амасу з гасьцінца на поле, і накрыў яго вопраткай, бо бачыў, што ўсе, якія
праходзяць, спыняюцца каля яго.
13 І калі ён прыняў Амасу з гасьцінца, кожны чалавек пайшоў за Ёавам у пагоню за Шэваю,
сынам Біхры.
14 І прайшоў Ёаў праз усе калены Ізраіля аж да Абэль-Бэт-Маахі. І ўсе [сыны] Бээры сабраліся
і пайшлі за ім.
15 І вось, прыйшлі яны, і абляглі [Шэву] ў Абэль-Бэт-Маасе, і насыпалі вал кругом гораду, і
сталі перад мурам. І ўвесь народ, якія [быў] з Ёавам, намагаўся разбурыць муры.
16 І нейкая разумная жанчына з гораду закрычала: «Слухайце, слухайце! Скажыце Ёаву, няхай
ён падыйдзе сюды, і я пагавару з ім».
17 І ён наблізіўся да яе, і сказала жанчына: «Ці ты Ёаў?» Ён сказаў: «Я». І яна сказала яму:
«Паслухай, што скажа служка твая». Ён сказаў: «Слухаю».

18 І сказала яна, кажучы: «Даўней так гаварылі: “Няхай спытаюцца ў Абэлі”, і так скончвалі
[справу].
19 Я — мірны і верны [горад] у Ізраілі, а ты хочаш усьмерціць горад і [зруйнаваць] маці
[гарадоў] Ізраіля. Навошта ты нішчыш спадчыну ГОСПАДА?»
20 І адказаў Ёаў, і сказаў: «Далёка, далёка гэта ад мяне, каб я разбураў або нішчыў.
21 Ня ў гэтым справа. Вось, чалавек з гары Эфраіма, Шэва, сын Біхры, імя ягонае, падняў руку
сваю на валадара Давіда. Выдайце яго, і я адыйду ад гораду». І сказала жанчына Ёаву: «Вось,
галава ягоная будзе перакінута табе праз мур».
22 І выйшла яна да ўсяго народу з мудрасьцю сваёй, і адсеклі галаву Шэвы, сына Біхры, і кінулі
яе Ёаву. І ён затрубіў у рог, і адыйшлі ад гораду кожны ў намёт свой. А Ёаў вярнуўся ў Ерусалім
да валадара.
23 І Ёаў [быў]над усім войскам Ізраіля, а Бэная, сын Егаяды — над Керэтамі і Пэлетамі,
24 Аданірам — над зборам даніны; Язафат, сын Ахілюда — канцлер,
25 Шэва — пісар, Цадок і Абіятар — сьвятары.
26 І таксама Іра з Яіру быў святаром у Давіда.

2 Сам 21

1 І стаўся голад у дні Давіда тры гады, год за годам. І раіўся Давід перад абліччам ГОСПАДА, і
ГОСПАД сказаў: «На Саўле і на доме ягоным [цяжэе] кроў, бо ён забіў Гібэонцаў».
2 І паклікаў валадар Гібэонцаў, і размаўляў з імі. А Гібэонцы не былі з сыноў Ізраіля, але з
рэшты Амарэйцаў, і сыны Ізраіля запрысягліся [не забіваць] іх, але Саўл спрабаваў зьнішчыць
іх з руплівасьці сваёй дзеля сыноў Ізраіля і Юды.
3 І сказаў Давід Гібэонцам: «Што я павінен вам зрабіць? І чым вас перапрасіць, каб вы
дабраславілі спадчыну ГОСПАДА?»
4 І Гібэонцы сказалі яму: «Ня трэба нам ані срэбра, ані золата ад Саўла або ад дому ягонага, і
ня трэба нам, каб быў забіты чалавек з Ізраіля». І сказаў [Давід]: «Што вы скажаце, я зраблю
вам».
5 І сказалі яны валадару: «Ад таго чалавека, які нас нішчыў і меў намер выгубіць нас, каб не
засталося нікога з нас у межах Ізраіля,
6 няхай будуць дадзены нам сем чалавек з сыноў ягоных, і мы іх павесім перад ГОСПАДАМ у
Гіве Саўла, [ранейшага] выбранца ГОСПАДА». І валадар сказаў: «Я дам вам».
7 Але пашкадаваў валадар Мэфібашэта, сына Ёнатана, сына Саўла, дзеля прысягі [перад]
ГОСПАДАМ паміж Давідам і Ёнатанам, сынам Саўла.
8 І ўзяў валадар двух сыноў Рыцпы, дачкі Аі, якіх яна нарадзіла Саўлу, Армона і Мэфібашэта, і
пяць сыноў Мэраб, дачкі Саўла, якіх яна нарадзіла Адрыэлю, сыну Барзілая з Мэхолы.
9 І [Давід] аддаў іх у рукі Гібэонцаў, і яны павесілі іх на гары перад абліччам ГОСПАДА. І загінулі
гэтыя сямёра разам, і былі яны забітыя ў першыя дні жніва, на пачатку жніва ячменю.
10 А Рыцпа, дачка Аі, узяла лахманы і разаслала іх на скале, і сядзела там ад пачатку жніва аж
пакуль не пайшоў на іх дождж з неба, і не дазваляла сядаць на іх птушкам паднебным удзень
і зьвярам палявым уначы.
11 І было паведамлена Давіду пра тое, што рабіла Рыцпа, дачка Аі, наложніца Саўла.
12 І пайшоў Давід, і ўзяў у гаспадароў Ябэшу Гілеадзкага косткі Саўла і косткі Ёнатана,
сына ягонага, якія тыя здабылі патаемна з плошчы ў Бэт-Шане, дзе іх былі там павесіўшы
Філістынцы, калі забілі Філістынцы Саўла ў Гільбоа.
13 І перанёс ён адтуль косткі Саўла і косткі Ёнатана, сына ягонага, і сабралі косткі павешаных.
14 І пахавалі косткі Саўла і косткі Ёнатана, сына ягонага, у зямлі Бэн’яміна ў Цэлі, у магіле
Кіша, бацькі ягонага. І зрабілі ўсё, што загадаў валадар. І быў упрошаны Бог, [каб зьлітаваўся]
над зямлёй.
15 І была зноў вайна Філістынцаў супраць Ізраіля. І пайшоў Давід і слугі ягоныя з ім, і ваявалі
з Філістынцамі. І Давід быў змучаны.

16 І Ішбі з Нову, які быў з нашчадкаў Рафы, і дзіда ягоная важыла трыста сыкляў медзі, і ён быў
падперазаны новым [мячом], казаў, што заб'е Давіда.
17 Але дапамог [Давіду] Абішай, сын Цэруі. І ўдарыў ён Філістынца, і забіў яго. І людзі Давіда
запрысяглі яго, кажучы: «Ужо больш ня пойдзеш з намі ваяваць, каб не патух сьветач Ізраіля».
18 І сталася пасьля гэтага, і зноў была вайна ў Гобе супраць Філістынцаў. І Сіббэхай з Хушу
забіў Сафа, які з нашчадкаў Рафы.
19 І яшчэ была вайна супраць Філістынцаў у Гобе. І Эльханан, сын Яарэ-Арэгіма з Бэтлеему,
забіў Галіята з Гату, у якога тронак дзіды быў як навой ткацкі.
20 І была яшчэ вайна ў Гаце, і быў вялізарны чалавек, які меў па шэсьць пальцаў на кожнай
руцэ і на кожнай назе, разам дваццаць чатыры пальцы, які таксама нарадзіўся ў Рафы.
21 І ён зьневажаў Ізраіля, і забіў яго Ёнатан, сын Шаммы, брата Давіда.
22 Гэтыя чатыры нарадзіліся ў Рафы з Гату. І яны загінулі ад рукі Давіда і ад рукі слугаў ягоных.

2 Сам 22

1 І прамовіў Давід словы гэтага сьпеву для ГОСПАДА ў дзень, калі вызваліў яго ГОСПАД з рук
усіх ворагаў ягоных і з рукі Саўла.
2 І ён сказаў: «ГОСПАД — скала мая і замчышча маё, Ён — Збаўца мой.
3 Бог мой, скала мая, у якой хаваюся, шчыт мой, рог збаўленьня майго! Ты — прыстанішча
маё і Абаронца мой, Збаўца мой, ад гвалту Ты вызваліў мяне.
4 Паклічу я ГОСПАДА, Які годны хвалы, і ад ворагаў маіх збаўлены буду.
5 Ахапілі мяне хвалі сьмерці, віры Бэліяла стрывожылі мяне,
6 путы пякельныя аплялі мяне, і пасткі сьмерці схапілі мяне.
7 У прыгнечаньні маім я клікаў ГОСПАДА і галасіў да Бога майго. І Ён пачуў са сьвятыні Сваёй
голас мой, і лямант мой [дайшоў] да вушэй Ягоных.
8 І дрыжучы, задрыжэла зямля, і падваліны нябесныя зварухнуліся і захісталіся, бо ўгнявіўся
Ён.
9 Узьняўся дым ад гневу Ягонага, і з вуснаў Ягоных — агонь палючы; вугольле распальваецца
ад Яго.
10 Нахіліў Ён нябёсы, і зыйшоў, і імгла пад нагамі Ягонымі.
11 Ён сеў на херувіма, і паляцеў, і ўзьнёсься на крылах ветру.
12 І зрабіў цемру заслонай сабе, намёт Ягоны з цёмных водаў, з густых хмараў.
13 Ад бляску перад Ім загарэлася вугольле вогненнае.
14 І загрымеў у небе ГОСПАД, і Найвышэйшы падаў голас Свой.
15 І Ён пусьціў стрэлы Свае, і расьцярушыў іх, і мноствам маланак зьбянтэжыў іх.
16 І выявіліся глыбіні мора, і адкрыліся падваліны сусьвету ад пагрозаў Тваіх, ГОСПАДЗЕ, і ад
подыху духу гневу Твайго.
17 Паслаўшы з вышыні, Ён схапіў мяне, выцягнуў мяне з водаў вялікіх,
18 вызваліў мяне ад ворага майго моцнага, і ад тых, якія ненавідзяць мяне, бо яны дужэйшыя
за мяне.
19 Яны схапілі мяне ў дзень няшчасьця майго, але ГОСПАД быў падпорай для мяне.
20 І Ён вывеў мяне на месца прасторнае, Ён выратаваў мяне, бо мне спагадае.
21 І даў мне ГОСПАД паводле праведнасьці маёй, паводле чыстасьці рук маіх мне аднагародзіў,
22 бо я захоўваў шляхі ГОСПАДА, і не адступаў бязбожна ад Бога майго.
23 Бо ўсе суды Ягоныя перада мною, і ад пастановаў Ягоных я не ўхіляўся,
24 Я быў беззаганны перад Ім, і захоўваў сябе ад беззаконьня.
25 І аднагародзіў мне ГОСПАД паводле праведнасьці маёй, і паводле чыстасьці рук маіх перад
вачыма Ягонымі.
26 З багабойным Ты будзеш багабойным, з чалавекам беззаганным будзеш беззаганны,
27 для чыстага сэрцам Ты чысты сэрцам, а для крывадушнага Ты падступны,
28 бо людзей прыгнечаных Ты збаўляеш, а вочы пыхлівыя паніжаеш.
29 Бо Ты, ГОСПАДЗЕ, — сьветач мой, ГОСПАД асьвятляе цемру маю.

30 Бо з Табою я атакую войска, і з Богам маім узыйду на муры.
31 Бог, беззаганны шлях Ягоны, слова ГОСПАДА [агнём] ачышчана, Ён — шчыт для ўсіх, хто ў
Ім мае надзею.
32 Бо хто Бог, апрача ГОСПАДА? І хто скала, апрача Бога нашага?
33 Бог, Які падпярэзвае мяне сілаю і робіць беззаганным шлях мой.
34 Ён робіць ногі мае, як у аленя, і на вышыні ставіць мяне.
35 Ён навучае рукі мае для бітвы, і рамёны мае напінаюць лук мядзяны.
36 І ты даў мне шчыт збаўленьня Твайго, і ласкавасьць Твая ўзьвялічвае мяне.
37 Ты пашырыў крокі мае, і не хісталіся ногі мае.
38 Я перасьледаваў ворагаў маіх, і даганяў іх, і не вяртаўся, пакуль ня зьнішчыў іх.
39 Я зьнішчыў іх так, што яны не маглі ўстаць і падалі пад ногі мае.
40 Ты падперазаў мяне сілай дзеля бітвы, і Ты паваліў перада мною тых, якія паўсталі супраць
мяне.
41 Ты даў мне [бачыць] карак ворагаў маіх, і тых, што мяне ненавідзяць, я вынішчыў.
42 Яны галасілі, і не было таго, хто іх збавіць. Яны да ГОСПАДА, але Ён не адказаў ім.
43 Я стоўк іх як пыл зямлі, як балота на вуліцы я таптаў іх.
44 Ты выратаваў мяне ад звадак людзей, паставіў мяне за галаву плямёнам. Людзі, якіх я ня
ведаў, будуць служыць мне.
45 Чуючы вушамі [пра мяне], яны слухаюцца мяне. Сыны чужынцаў падпарадкаваліся мне.
46 Сыны чужынцаў млеюць і трымцяць у агароджах сваіх.
47 Жыве ГОСПАД, дабраслаўлёная скала мая, і няхай узвысіцца Бог збаўленьня майго.
48 Бог, Які адпомсьціў за мяне і схіліў народы перада мною,
49 Які выратаваў мяне ад ворагаў маіх, і ўзвысіў мяне па-над тымі, што паўсталі супраць мяне,
ад чалавека злачыннага вызваліў мяне.
50 Дзеля гэтага буду славіць Цябе, ГОСПАДЗЕ, сярод народаў, і буду імя Тваё выслаўляць,
51 бо Ты ўзьвялічыў збаўленьнем валадара Твайго і зьявіў міласэрнасьць памазанцу Твайму,
Давіду, і насеньню ягонаму на вякі».

2 Сам 23

1 Гэта апошнія словы Давіда: «Сказаў Давід, сын Есэя, сказаў чалавек, які высока пастаўлены,
памазанец Бога Якубавага, сьпявак псальмаў Ізраіля.
2 Дух ГОСПАДА гаворыць праз мяне, і слова Ягонае — на языку маім.
3 Сказаў Бог Ізраіля, гаварыў мне Скала Ізраіля: “Той праведна пануе над людзьмі, які пануе ў
страху Божым,
4 ён — як сьвятло заранкі пры ўзыходзе сонца, як раніца без хмурынак, як яснасьць пасьля
дажджу, і як трава, што [расьце] з зямлі”.
5 Ці не такі дом мой перад Богам? Бо заключыў Ён са мною запавет вечны, устаноўлены і
пэўны. Ад Яго збаўленьне маё і ўсё жаданьне маё.
6 [Сыны] Бэліяла будуць выкінутыя, як церні, якіх не бяруць рукою.
7 А калі хто будзе дакранеацца іх, няхай узброіцца жалезам або цаўём дзіды, і паліць іх агнём
дашчэнту».
8 Вось імёны волатаў Давіда: Ёшэб-Башшэбэт з Тахкемону, начальнік між трох; ён падняў на
дзіду сваю васемсот чалавек, забітых адным разам.
9 Пасьля яго Элеазар, сын Додо, сына Ахоха, між трох волатаў. Быў ён з Давідам, калі
[Ізраільцяне] сабраліся на бітву, а Філістынцы зьневажалі іх. І пабеглі Ізраільцяне,
10 і ён адзін стаяў і біў Філістынцаў, ажно самлела рука ягоная і прыліпла рука ягоная да мяча.
І ГОСПАД даў вялікую перамогу ў той дзень, і народ вярнуўся, каб рабаваць забітых.
11 Пасьля яго Шамма, сын Агэ з Арару. І сабраліся Філістынцы ў Лехі, і быў там палетак, поўны
сачэвіцы. І людзі ўцяклі перад Філістынцамі,
12 і ён стаў адзін сярод палетка, і выратаваў іх, а Філістынцаў пабіў. І ГОСПАД даў вялікую
перамогу.

13 Гэтыя трое спасярод трыццаці галоўных [у часе] жніва зыйшлі і прыйшлі да Давіда ў пячору
Адулям, а дружына Філістынцаў разлажылася табарам у лагчыне Рэфаім.
14 Давід быў у крэпасьці, а дружына Філістынцаў — у Бэтлееме.
15 І захацеў Давід піць, і сказаў: «Хто дасьць мне напіцца вады са студні, якая ў Бэтлееме каля
брамы!»
16 І трое гэтых волатаў напалі на табар Філістынцаў, і набралі вады ў Бэтлееме са студні, якая
каля брамы, і прынесьлі, і прыйшлі да Давіда, але ён не захацеў піць [яе] і выліў [ваду] для
ГОСПАДА,
17 і сказаў: «Няхай аддаліць мяне ГОСПАД, каб зрабіць гэта. Ці ж буду я піць кроў гэтых людзей,
якія пайшлі, [рызыкуючы] душамі сваімі». І не захацеў піць [ваду]. Вось гэта зрабілі тры
волаты.
18 І Абішай, брат Ёава, сын Цэруі, [быў] начальнікам трыццаці. Ён падняў на дзіду сваю трыста
[ворагаў], і забіў [іх]. І ён меў імя сярод тых трох.
19 Сярод трыццаці ён быў найвыдатнейшы, і быў князем іхнім, але тым тром не дараўняўся.
20 І Бэная, сын Егаяды з Кабцээлю, сын мужа адважнага, [слаўны] шматлікімі справамі. Ён
перамог двух ільвоў Мааву, і ён зыйшоў, і забіў ільва ў яме ў дзень завеі.
21 І ён забіў Эгіпцяніна, чалавека вялізнага. У руцэ Эгіпцяніна [была] дзіда, а ён пайшоў на яго
з кіем, і вырваў з рукі Эгіпцяніна дзіду, і забіў яго дзідаю ягонай.
22 Гэта зрабіў Бэная, сын Егаяды, і ён меў імя між трох волатаў.
23 Быў ён паважаны сярод трыццаці, але тым тром не дараўняўся. І Давід паставіў яго над
вартаю сваёй.
24 [А тых трыццаць]: Асаэль, брат Ёава, Эльханан, сын Додо з Бэтлеему,
25 Шамма з Хароду і Эліка з Хароду,
26 Хэлец з Пэлету і Іра, сын Іккеша з Тэкоа,
27 Абіезэр з Анатоту і Мэбунай з Хушы,
28 Цальмон з Ахоху і Магарай з Нэтофы,
29 Хэлеў, сын Бааны, з Нэтофы, і Іттай, сын Рыбая з Гівы сыноў Бэн'яміна.
30 Бэная з Піратону і Гіддай з Нахале-Гаашу,
31 Абі-Альбон з Арабы і Азмавэт з Бахурыму,
32 Эліяхба з Шаальвону і сыны Яшэна, Ёнатан,
33 Шамма з Арару, Ахіям, сын Шарара з Арару,
34 Эліфэлет, сын Ахасбая, сына Маахі, і Эліям, сын Ахітафэля з Гіло,
35 Хецарай з Кармэлю і Паарай з Арабы,
36 Ігаль, сын Натана з Цовы, і Бані з Гаду,
37 Цэлек з Амона, і Нахарай з Бээроту, збраяносец Ёава, сына Цэруі,
38 Іра з Ітра, Гарэб з Ітра,
39 і Урыя Хет; усіх — трыццаць сем.

2 Сам 24

1 І зноў узгарэўся гнеў ГОСПАДА на Ізраіля, і намовіў [шатан] Давіда супраць [Ізраіля], кажучы:
«Ідзі і палічы Ізраіля і Юду».
2 І сказаў валадар Ёаву, начальніку войска, які быў пры ім: «Абыйдзі ўсе калены Ізраіля ад
Дану аж да Бээр-Шэвы і палічы народ, каб я ведаў лік народу».
3 І сказаў Ёаў валадару: «Няхай ГОСПАД, Бог твой, дадасьць столькі, колькі ёсьць, і яшчэ сто
разоў столькі, і няхай вочы гаспадара майго, валадара, убачаць гэта! Але навошта, гаспадару
мой, валадар, ты захацеў зрабіць гэта?»
4 Але слова валадара было мацнейшым за Ёава і начальнікаў войска. І выйшлі Ёаў і начальнікі
войска ад аблічча валадара, каб палічыць народ Ізраіля.
5 І пераправіліся яны праз Ярдан, і разлажыліся табарам у Араэры, на поўдзень ад гораду, які
на сярэдзіне лагчыны Гад, у бок Язэру.
6 І пайшлі яны ў Гілеад і ў зямлю Тахтыль-Хадшы, і пайшлі ў Дан-Яан, і павярнулі ў бок Сідону.

7 І прыйшлі яны ў крэпасьць Тыр, і ў-ва ўсе гарады Хівеяў і Хананейцаў, і накіраваліся ў Нэгеў
Юды і ў Бээр-Шэву.
8 І абыйшлі яны ўсю зямлю, і праз дзевяць месяцаў і дваццаць дзён вярнуліся ў Ерусалім.
9 І Ёаў перадаў валадару лік перапісанага народу. І было ў Ізраілі васемсот тысячаў ваяроў,
узброеных мячом, а ў Юдзе — пяцьсот тысячаў.
10 І задрыжэла сэрца Давіда пасьля таго, як ён палічыў народ, і сказаў Давід ГОСПАДУ: «Цяжка
саграшыў я гэтым учынкам. І цяпер, ГОСПАДЗЕ, прашу, даруй віну слугі твайго, бо вельмі я
неразумна зрабіў».
11 І ўстаў Давід раніцаю, і было слова ГОСПАДА да прарока Гада, відушчага Давіда, кажучы:
12 «Ідзі і скажы Давіду: “Гэта кажа ГОСПАД. Тры [кары] Я кладу перад табою. Выберы сабе
адну з іх, і Я зраблю табе гэта”».
13 І пайшоў Гад да Давіда, і паведаміў яму, і сказаў яму: «Ці будзе панаваць голад тры гады
ў зямлі тваёй, або тры месяцы ты будзеш уцякаць перад абліччам ворагаў тваіх, якія будуць
перасьледаваць цябе, або тры дні будзе панаваць пошасьць у зямлі тваёй. І цяпер падумай і
ўбач, які адказ мне занесьці Таму, Які мяне паслаў».
14 І сказаў Давід Гаду: «Я ў уціску вялікім! Але [лепш] патрапіць у рукі ГОСПАДА, бо вялікая
міласэрнасьць Ягоная, а ў рукі чалавека [лепш] не трапляць!»
15 І спаслаў ГОСПАД заразу на Ізраіля ад раніцы да вызначанага часу. І памерла тады,
пачынаючы ад Дану да Бээр-Шэвы семдзясят тысячаў чалавек.
16 І выцягнуў анёл руку сваю на Ерусалім, каб яго зьнішчыць, але ГОСПАД зьлітаваўся дзеля
няшчасьця і сказаў анёлу, што нішчыў народ: «Досыць, цяпер спыні руку тваю!» А быў анёл
ГОСПАДА каля току Араўны Евусэя.
17 І сказаў Давід ГОСПАДУ, калі ўбачыў анёла, які забіваў народ: «Вось, я саграшыў, я вінаваты,
але гэтыя авечкі, што яны зрабілі? Прашу, няхай рука Твая будзе супраць мяне і супраць дому
бацькі майго!»
18 У той дзень прыйшоў Гад да Давіда і сказаў яму: «Ідзі і пастаў ахвярнік ГОСПАДУ на таку
Араўны Евусэя».
19 І пайшоў Давід паводле слова Гада, як загадаў ГОСПАД.
20 І глянуў Араўна, і ўбачыў валадара і слугаў ягоных, што ідуць да яго. І выйшаў ён, і
пакланіўся валадару абліччам сваім да зямлі,
21 і сказаў Араўна: «Што за прычына, што прыходзіць гаспадар мой, валадар, да слугі свайго?»
І сказаў Давід: «Каб купіць у цябе ток і пабудаваць на ім ахвярнік ГОСПАДУ, і тады спыніцца
пляга, якая ў народзе».
22 І сказаў Араўна Давіду: «Няхай бярэ гаспадар мой, валадар, і складае ў ахвяру тое, што
добрае ў вачах ягоных. Вось, валы на цэласпаленьне, вось, малатарні і ёрмы валовыя на дровы.
23 Усё аддае Араўна валадару валадароў!» І сказаў Араўна валадару: «Няхай ГОСПАД, Бог твой,
мае да цябе ласку!»
24 І сказаў валадар Араўне: «Не! Я, купляючы, куплю за грошы ў цябе і не складу для ГОСПАДА,
Бога майго, цэласпаленьне, якое [атрымаў] задарма». І купіў Давід ток і валоў за пяцьдзясят
сыкляў срэбра.
25 І пабудаваў Давід там ахвярнік ГОСПАДУ, і склаў цэласпаленьні і ахвяры мірныя. І
зьлітаваўся ГОСПАД над зямлёю, і спыніў плягу для Ізраіля.

ПЕРШАЯ КНІГА ВАЛАДАРОЎ

1 І валадар Давід састарэўся, і меў шмат гадоў, і накрывалі яго коўдрамі, а ён ніяк ня мог
сагрэцца.
2 І сказалі яму слугі ягоныя: «Няхай пашукаюць гаспадару нашаму, валадару, маладую
дзяўчыну. Яна будзе служыць перад абліччам валадара, і апекавацца ім, і будзе спаць на
ўлоньні ягоным, і грэць гаспадара нашага, валадара».
3 І шукалі прыгожую маладую дзяўчыну ў-ва ўсіх межах Ізраіля, і знайшлі Абішаг Шунамянку,
і прывялі яе да валадара.
4 Дзяўчына была вельмі прыгожая; яна апекавалася валадаром і паслугавала яму, але валадар
не пазнаў яе.
5 А Адонія, сын Хагіты, узганарыўся і сказаў: «Я буду валадарыць!» І ён зрабіў сабе калясьніцу,
коньнікаў і пяцьдзясят чалавек, што беглі перад абліччам ягоным.
6 А бацька ягоны ніколі на яго не сварыўся, кажучы: «Навошта гэта робіш?» А быў ён вельмі
прыгожы, яго нарадзіла [маці] пасьля Абсалома.
7 Ён дамовіўся з Ёавам, сынам Цэруі, і з Абіятарам сьвятаром, і яны дапамагалі Адонію.
8 Але Цадок сьвятар, і Бэная, сын Егаяды, і Натан прарок, і Шымэй, і Рэй, і волаты Давіда не
былі на баку Адоніі.
9 І склаў у ахвяру Адонія авечак, валоў і кормных цялят каля Эвэн-Газахэлет, што каля Эн-
Рагеля, і паклікаў усіх братоў сваіх, сыноў валадара, і ўсіх людзей Юды, слугаў валадара.
10 Але прарока Натана і Бэнаю, і волатаў, і брата свайго Салямона не паклікаў.
11 І сказаў Натан Батшэве, маці Салямона, кажучы: «Ці ты ня чула, што валадарыць Адонія,
сын Хагіты, а гаспадар наш Давід [пра гэта] ня ведае?
12 І цяпер дазволь даць раду табе, каб ты захавала душу тваю і душу сына твайго Салямона.
13 Ідзі і ўвайдзі да валадара Давіда, і скажы яму: “Гаспадару мой, валадар, ці не запрысяг ты
мне, служцы тваёй, кажучы: "Салямон, сын твой, будзе пасьля мяне валадаром, і ён будзе
сядзець на пасадзе"? Дык чаму валадарыць Адонія?”
14 Вось, калі ты яшчэ будзеш размаўляць з валадаром, пасьля цябе прыйду я і падтрымаю
словы твае».
15 І Батшэва ўвайшла да валадара ў спальню, а валадар быў вельмі стары, і Абішаг Шунамянка
паслугавала валадару.
16 І ўкленчыла Батшэва, і пакланілася валадару. І сказаў валадар «Што табе [трэба]?»
17 І яна сказала яму: «Гаспадару мой, ты прысягаў на ГОСПАДА, Бога твайго, служцы тваёй:
“Салямон, сын твой, будзе валдарыць пасьля мяне, і ён будзе сядзець на пасадзе маім”.
18 А вось цяпер Адонія стаў валадаром, а ты, гаспадару мой, валадар, ня ведаеш [пра гэта].
19 І ён склаў у ахвяру мноства валоў, кормных цялят і авечак, і паклікаў усіх сыноў валадара,
і Абіятара сьвятара, і Ёава, начальніка войска. А Салямона, слугу твайго, не паклікаў.
20 Але ты, гаспадару мой, — валадар, і на цябе [зьвернуты] вочы ўсяго Ізраіля, каб ты
паведаміў, хто пасьля цябе, гаспадару мой, валадар, будзе сядзець на пасадзе!
21 Інакш, калі ты, гаспадару мой, валадар, засьнеш з бацькамі сваімі, я і сын мой Салямон
будуць [абвешчаны] грэшнікамі».
22 І вось, яна яшчэ гаварыла з валадаром, і прыйшоў Натан прарок.
23 І паведамілі валадару, кажучы: «Вось, Натан прарок». І ён прыйшоў перад аблічча валадара,
і пакланіўся валадару абліччам да зямлі.
24 І сказаў Натан: «Гаспадару мой, валадар, ці ты сказаў: “Адонія будзе валадарыць пасьля
мяне, і ён будзе сядзець на пасадзе маім”?
25 Бо сёньня ён пайшоў і склаў у ахвяру валоў, кормных цялят і мноства авечак, і паклікаў
усіх сыноў валадарскіх, і начальнікаў войска, і сьвятара Абіятара, і вось, яны перад абліччам
ягоным ядуць і п’юць, і кажуць: “Няхай жыве валадар Адонія!”

26 А мяне, слугу твайго, і сьвятара Цадока, і Бэнаю, сына Егаяды, і Салямона, слугу твайго, ён
не паклікаў.
27 Ці ня сталася гэта з волі гаспадара майго, валадара, і чаму ты ня выявіў мне, слузе твайму,
хто будзе сядзець на пасадзе гаспадара майго, валадара, пасьля яго?»
28 І адказаў валадар Давід, і сказаў: «Паклічце да мяне Батшэву». І ўвайшла яна перад аблічча
валадара, і стала перад абліччам валадара.
29 І прысягнуў валадар, і сказаў: «Як жывы ГОСПАД, Які выратаваў душу маю з усялякай бяды!
30 Як я прысягнуў табе ГОСПАДАМ, Богам Ізраіля, кажучы, што Салямон, сын твой, будзе
валадаром пасьля мяне, і ён будзе сядзець на пасадзе маім замест мяне, так сёньня і зраблю».
31 І Батшэва схіліла аблічча сваё да зямлі, і пакланілася валадару, і сказала: «Няхай жыве
гаспадар мой, валадар Давід, на вякі!»
32 І сказаў валадар Давід: «Паклічце да мяне Цадока сьвятара, і Натана прарока, і Бэнаю, сына
Егаяды». І яны прыйшлі перад аблічча валадара,
33 І сказаў ім валадар: «Вазьміце з сабою слугаў гаспадара вашага, і пасадзіце Салямона, сына
майго, на мула майго, і вядзіце яго ў Гіхон,
34 і няхай там сьвятар Цадок і прарок Натан памажуць яго на валадара Ізраіля, і затрубіце ў
рог, і кажыце: “Няхай жыве валадар Салямон!”
35 І пойдзеце за ім, і прыйдзе ён, і сядзе на пасадзе маім, і будзе валадарыць пасьля мяне, бо я
загадаў паставіць яго правадыром Ізраіля і Юды».
36 І адказаў Бэная, сын Егаяды, валадару, і сказаў: «Амэн, няхай скажа гэтак ГОСПАД, Бог
гаспадара майго, валадара!
37 Як быў ГОСПАД з гаспадаром маім, валадаром, так няхай будзе Ён з Салямонам і няхай
узвялічыць пасад ягоны больш за пасад гаспадара майго, валадара Давіда!»
38 І пайшоў Цадок сьвятар, і Натан прарок, і Бэная, сын Егаяды, і Керэты, і Пэлеты, і пасадзілі
Салямона на мула валадара Давіда, і завялі яго ў Гіхон.
39 І сьвятар Цадок узяў рог алею з Сялібы, і памазаў Салямона, і затрубіў у рог, і закрычаў увесь
народ: «Няхай жыве валадар Салямон!»
40 І ўвесь народ ішоў за [Салямонам], і граў народ на флейтах, і цешыўся радасьцю вялікай, і
зямля гучэла ад гоману іхняга.
41 І пачуў [гэта] Адонія і ўсе запрошаныя ім, а ўжо яны скончылі есьці. І Ёаў пачуў гук рогу, і
сказаў: «Што гэта за гоман узрушанага гораду?»
42 Ён яшчэ гаварыў, і вось, прыйшоў Ёнатан, сын Абіятара сьвятара. І сказаў яму Адонія:
«Увайдзі, бо ты — чалавек шчыры і добрае абвесьціш».
43 І адказаў Ёнатан, і сказаў Адоніі: «Зусім не! Гаспадар наш, валадар Давід, зрабіў валадаром
Салямона,
44 і паслаў з ім Цадока сьвятара, і Натана прарока, і Бэнаю, сына Егаяды, і Керэтаў, і Пэлетаў. І
яны пасадзілі Салямона на мула валадара,
45 а памазаў яго сьвятар Цадок і прарок Натан на валадара ў Гіхоне. І адтуль выйшлі яны з
радасьцю, і горад загаманіў. І гэта той гоман, які вы чуеце.
46 А Салямон сеў на пасадзе валадарскім.
47 І слугі валадарскія прыйшлі таксама дабраславіць гаспадара нашага, валадара Давіда,
кажучы: “Няхай Бог дасьць дабрабыт для імя Салямона па-над імя тваё, і ўзьвялічыць пасад
ягоны па-над пасад твой”. І валадар пакланіўся на ложку сваім.
48 І сказаў валадар так: “Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які даў сёньня вачам маім
бачыць таго, які сядзіць на пасадзе маім, і вочы мае бачылі [гэта]”».
49 І спалохаліся, і паўскоквалі ўсе, запрошаныя Адоніем, і кожны з іх пайшоў дарогаю сваёй.
50 А Адонія, баючыся [стаць] перад абліччам Салямона, устаў, і пайшоў, і ўхапіўся за рогі
ахвярніка.
51 І паведамілі Салямону, кажучы: «Вось, Адонія баіцца валадара Салямона, і вось, ён ухапіўся
за рогі ахвярніка, кажучы: “Няхай сёньня прысягне мне валадар Салямон, што не заб’е слугі
свайго мячом”».

52 І сказаў Салямон: «Калі ён будзе чалавекам шчырым, не спадзе на зямлю ніводны волас
ягоны, але калі выявіцца ў ім ліхоцьце, памрэ».
53 І паслаў валадар Салямон, і адвялі яго ад ахвярніка, і ён прыйшоў, і пакланіўся валадару
Салямону, а Салямон сказаў яму: «Ідзі ў дом твой».

1 Вал 2

1 І наблізіліся дні паміраць Давіду, і загадаў ён сыну свайму Салямону, кажучы:
2 «Я ўзыходжу на шлях [жыхароў] усёй зямлі. Ты ж будзь цьвёрды і будзь мужны.
3 І захоўвай загады ГОСПАДА, Бога твайго, і хадзі шляхамі Ягонымі, і захоўвай пастановы
Ягоныя, і прыказаньні Ягоныя, і прысуды Ягоныя, і сьведчаньні Ягоныя, як напісана ў Законе
Майсеевым, каб меў ты посьпех у-ва ўсім, што ты будзеш рабіць, і паўсюль, куды ты пойдзеш,
4 каб зьдзейсьніў ГОСПАД слова Сваё, якое гаварыў мне, кажучы: “Калі сыны твае будуць
захоўваць шляхі свае і калі будуць хадзіць перад абліччам Маім у праўдзе ўсім сэрцам сваім і
ўсёю душою сваёй, ня будзе адкінуты нашчадак твой ад пасаду Ізраіля”.
5 І ты таксама ведаеш, што зрабіў мне Ёаў, сын Цэруі, што ён зрабіў з двума начальнікамі
войска Ізраіля, з Абнэрам, сынам Нэра, і з Амасам, сынам Етэра, якіх ён забіў. Ён праліў кроў
вайны ў [час] міру, і апаганіў крывёй вайны пояс на сьцёгнах сваіх і сандалы на нагах сваіх.
6 Учыні з ім паводле мудрасьці тваёй, і не дазволь зыйсьці сівізне ягонай у адхлань у супакоі.
7 А сынам Барзілая з Гілеаду зьявіш міласэрнасьць, і няхай яны ядуць за сталом тваім, бо яны
прыйшлі з дапамогаю, калі я ўцякаў перад Абсаломам, братам тваім.
8 І вось, пры табе Шымэй, сын Гера, Бэн’ямінец з Бахурыму, які праклінаў мяне ліхім
праклёнам у дзень, калі я ішоў у Маханаім, але ён сустрэў мяне каля Ярдану, і я прысягнуў
яму на ГОСПАДА, кажучы: “Не заб’ю цябе мячом”.
9 Але ты не даруеш яму, бо ты чалавек мудры, і ведаеш, што яму зрабіць, і зьвядзеш сівізну
ягоную ў крыві ў адхлань».
10 І супачыў Давід з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў горадзе Давіда.
11 Сорак гадоў валадарыў Давід над Ізраілем: у Хеўроне валадарыў сем гадоў, а ў Ерусаліме
валадарыў трыццаць тры гады.
12 І сеў Салямон на пасадзе Давіда, бацькі свайго, і валадараньне ягонае вельмі ўмацавалася.
13 І прыйшоў Адонія, сын Хагіты, да Батшэвы, маці Салямона, і яна сказала: «Ці з мірам
прыходзіш?» Ён адказаў: «З мірам».
14 І сказаў: «[Маю] слова маё да цябе». Яна сказала: «Гавары».
15 І ён сказаў: «Ты ведаеш, што валадараньне было [прызначана] мне, і ўвесь Ізраіль зьвяртаў
аблічча сваё на мяне, каб я валадарыў, але валадарства адыйшло ад мяне, і яно ў брата майго,
бо ГОСПАДАМ яно [дадзена] яму.
16 А цяпер адну просьбу прашу ў цябе; не адварочвайся ад аблічча майго». Яна сказала яму:
«Гавары».
17 І ён сказаў: «Прашу, каб ты сказала валадару Салямону, бо ён не адвернецца ад аблічча
твайго, каб за жонку даў мне ён Абішаг Шунамянку».
18 І Батшэва сказала: «Добра, я пагавару адносна цябе з валадаром».
19 І прыйшла Батшэва да валадара Салямона, каб пагаварыць з ім пра Адонію. І валадар устаў
на спатканьне з ёй, і пакланіўся ёй, і сеў зноў на пасад свой. І паставіў ён пасад для маці
валадара, і яна села праваруч яго.
20 І яна сказала: «Маю да цябе адну малую просьбу, не адвярніся ад аблічча майго». І сказаў
ёй валадар: «Прасі, маці мая, бо я не адвярнуся ад аблічча твайго».
21 І яна сказала: «Дай Абішаг Шунамянку за жонку Адоніі, брату твайму».
22 І адказаў валадар Салямон, і сказаў маці сваёй: «Чаму ты просіш Абішаг Шунамянку для
Адоніі? Прасі таксама валадарства яму! Бо ён — старэйшы брат мой, мае пры сабе Абіятара
сьвятара і Ёава, сына Цэруі».
23 І прысягнуў валадар Салямон на ГОСПАДА, кажучы: «Няхай гэта зробіць мне Бог, і гэта
дадасьць, калі ня супраць душы сваёй сказаў Адонія слова гэтае.

24 І цяпер, як жывы ГОСПАД, Які моцна паставіў мяне і пасадзіў на пасад Давіда, бацькі майго,
і Які, як прадказваў, пабудаваў мне дом, сёньня Адонія будзе забіты!»
25 І паслаў валадар Салямон Бэнаю, сына Егаяды, і ён забіў [Адонію], і той памёр.
26 А Абіятару сьвятару сказаў валадар: «Ідзі ў Анатот на поле тваё, бо ты — чалавек, [варты]
сьмерці; але сёньня я не заб'ю цябе, бо ты насіў Каўчэг Госпада ГОСПАДА перад абліччам
Давіда, бацькі майго, і ты перанёс усе цяжкасьці, якія пераносіў бацька мой».
27 І выгнаў Салямон Абіятара, каб ня быў ён сьвятаром ГОСПАДА, і споўнілася слова ГОСПАДА,
якое Ён прамовіў пра дом Гэлія ў Шыло.
28 І дайшла вестка [пра гэта] да Ёава, бо Ёаў прыхіліўся да Адоніі, хоць да Абсалома не схіляўся.
І ўцёк Ёаў у Намёт ГОСПАДА, і ўхапіўся за рогі ахвярніка.
29 І паведамілі валадару Салямону, што Ёаў уцёк у Намёт ГОСПАДА і вось, ён пры ахвярніку. І
паслаў Салямон Бэнаю, сына Егаяды, кажучы: «Ідзі і забі яго!»
30 І ўвайшоў Бэная ў Намёт ГОСПАДА, і сказаў [Ёаву]: «Гэта кажа валадар: "Выходзь!"» А той
сказаў: «Ня выйду, але тут памру». І Бэная пераказаў слова гэтае валадару, кажучы: «Гэтак
прамовіў Ёаў і гэтак адказаў».
31 І сказаў яму валадар: «Зрабі, як ён сказаў, і забі яго, і пахавай яго, і ачысьці мяне і дом бацькі
майго ад нявіннай крыві, якую выліў Ёаў.
32 І зьверне ГОСПАД кроў ягоную на галаву ягоную, бо ён забіў двух мужоў праведных і лепшых
за яго, і забіў іх мячом, і ня ведаў [пра гэта] бацька мой Давід; [ён забіў] Абнэра, сына Нэра,
начальніка войска Ізраіля, і Амасу, сына Етэра, начальніка войска Юды.
33 І зьвернецца кроў іхняя на галаву Ёава і на галаву насеньня ягонага вечна. А для Давіда і
насеньня ягонага, і для дому ягонага, і для пасаду ягонага няхай будзе супакой ад ГОСПАДА
вечна».
34 І пайшоў Бэная, сын Егаяды, і ўдарыў [Ёава], і забіў яго. І быў ён пахаваны ў доме сваім у
пустыні.
35 І паставіў валадар Бэнаю, сына Егаяды, начальнікам над войскам замест яго, а Цадока
сьвятара паставіў валадар на месца Абіятара.
36 І паслаў валадар, і паклікаў Шымэя, і сказаў яму: «Пабудуй сабе дом у Ерусаліме, і жыві там,
і не выходзь адтуль нікуды.
37 У дзень, калі ты выйдзеш і пяройдзеш ручай Кедрон, ведай, што сьмерцю памрэш. Кроў твая
будзе на галаве тваёй».
38 І сказаў Шымэй валадару: «Добрае слова, якое прамовіў гаспадар мой, валадар. Так і зробіць
слуга твой». І жыў Шымэй у Ерусаліме шмат дзён.
39 І сталася, што праз тры гады двое слугаў Шымэя ўцяклі да Ахіша, сына Маахі, валадара Гату.
І паведамілі Шымэю, кажучы: «Вось, слугі твае ў Гаце».
40 І ўстаў Шымэй, і сеў на асла свайго, і пайшоў у Гат да Ахіша шукаць слугаў сваіх, і пайшоў
Шымэй, і прывёў слугаў сваіх з Гату.
41 І паведамілі Салямону, што Шымэй хадзіў у Гат з Ерусаліму і вярнуўся.
42 І паслаў валадар, і паклікаў Шымэя, і сказаў яму: «Ці не запрысяг я табе на ГОСПАДА і ці не
засьведчыў табе, кажучы: "У дзень, калі ты зыйдзеш адсюль і пойдзеш туды ці сюды, ведай,
што сьмерцю памрэш"? І ты казаў мне: "Добрае слова, якое я пачуў".
43 Дык чаму не захаваў ты прысягі перад ГОСПАДАМ і загаду, які я табе даў?»
44 І сказаў валадар Шымэю: «Ты ведаеш усё гэтае зло, і ведае сэрца тваё, якое зло ты зрабіў
бацьку майму Давіду. І зьверне ГОСПАД ліхоту тваю на галаву тваю.
45 А валадар Салямон будзе дабраслаўлёны, і пасад Давіда будзе трываць перад абліччам
ГОСПАДА вечна».
46 І валадар загадаў Бэнаі, сыну Егаяды, і ён выйшаў, і ўдарыў яго, і ён памёр. І ўмацавалася
валадарства ў руцэ Салямона.

1 Вал 3

1 І пасваячыўся Салямон з фараонам, валадаром Эгіпту, і ўзяў за жонку дачку фараона. І

ўвёў ён яе ў горад Давіда, калі яшчэ не пабудаваў дом сабе, і Дом ГОСПАДА, і муры кругом
Ерусаліму.
2 Але народ складаў ахвяры на ўзгорках, бо ня быў яшчэ пабудаваны Дом для імя ГОСПАДА ў
тыя дні.
3 І любіў Салямон ГОСПАДА, ходзячы паводле пастановаў Давіда, бацькі свайго, але і ён складаў
ахвяры і каджэньні на ўзгорках.
4 І пайшоў валадар у Гібэон, каб там скласьці ахвяру, бо там быў вялікі ўзгорак. І Салямон
склаў на тым ахвярніку тысячу цэласпаленьняў.
5 У Гібэоне зьявіўся Салямону ўначы ў-ва сьне ГОСПАД, і сказаў Бог: «Прасі тое, што [хочаш], і
Я дам табе».
6 І сказаў Салямон: «Ты зьявіў слузе твайму Давіду, бацьку майму, міласэрнасьць вялікую,
калі ён хадзіў перад абліччам Тваім у праўдзе і праведнасьці, і ў правасьці сэрца адносна Цябе.
І захаваў Ты яму вялікую міласэрнасьць гэтую, і даў яму сына, які сядзіць на пасадзе ягоным,
як гэта [ёсьць] сёньня.
7 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа мой, Ты зрабіў валадаром слугу Твайго на месцы Давіда, бацькі
майго, а я — малады юнак, ня ўмею выходзіць і прыходзіць.
8 І слуга Твой сярод народу Твайго, які Ты выбраў, народу шматлікага, якога нельга ані
палічыць, ані перапісаць, бо яго шмат.
9 Дык дай слузе Твайму сэрца, якое слухае, каб судзіць народ Твой і адрозьніваць, што добрае,
а што ліхое. Бо хто ж можа судзіць такі шматлікі народ Твой?»
10 І добрае было слова ў вачах Госпада, што прасіў Салямон пра гэтую рэч.
11 І сказаў Бог [Салямону]: «За тое, што ты прасіў у малітве гэтую рэч, і не прасіў для сябе
доўгіх дзён, і не прасіў для сябе багацьця, і не прасіў для сябе душаў ворагаў тваіх, але прасіў
ты разуменьня, каб слухаць у судзе,
12 вось, Я зраблю паводле словаў тваіх. Вось, Я даю табе сэрца мудрае і разважлівае, так што
такога, як ты, не было перад табою і ня будзе пасьля цябе.
13 І таксама Я даю табе тое, пра што ты прасіў, даю табе таксама багацьце і славу такую, што
падобным табе ня будзе ніхто з валадароў у-ва ўсе дні твае.
14 А калі ты будзеш хадзіць шляхамі Маімі, калі будзеш захоўваць прыказаньні Мае і пастановы
Мае, як хадзіў Давід, бацька твой, Я зраблю доўгімі дні твае».
15 І прачнуўся Салямон, і вось, гэта сон. І прыйшоў ён у Ерусалім, і стаў перад Каўчэгам
Запавету Госпада, і склаў ахвяры цэласпаленьня і ахвяры мірныя, і зрабіў банкет для ўсіх
слугаў сваіх.
16 І прыйшлі да валадара дзьве жанчыны блудніцы, і сталі перад абліччам ягоным.
17 І адна жанчына сказала: «О, гаспадару мой, я і гэта жанчына жывем у адным доме. І пры ёй
у доме [гэтым] я нарадзіла.
18 І сталася праз тры дні пасьля родаў маіх, таксама гэтая жанчына нарадзіла. І былі мы разам,
і апрача нас дзьвюх нікога іншага з намі ў доме не было.
19 І ўначы памёр сын жанчыны гэтай, бо, [сплючы], яна задушыла яго.
20 І яна ўстала ўначы, і ўзяла сына майго ад мяне, калі служка твая спала, і палажыла яго на
ўлоньні сваім. А сына свайго, мёртвага, палажыла на ўлоньне маё.
21 І я ўстала раніцаю, каб пакарміць сына свайго, і вось, ён мёртвы. А калі пры сьвятле я
прыгледзелася, вось, ня мой гэта сын, якога я нарадзіла».
22 А сказала іншая жанчына: «Не, бо сын мой жывы, а твой памёр». А тая казала: «Не, гэта
твой сын памёр, а мой жывы». І спрачаліся яны перад абліччам валадара.
23 І сказаў валадар: «Гэтая кажа: “Сын мой жывы, а сын твой памёр”, а тая кажа: “Не, бо твой
сын памёр, а мой сын жывы”».
24 І сказаў валадар: «Прынясіце мне меч!» І прынесьлі перад аблічча валадара меч.
25 І сказаў валадар: «Расьсячыце жывое дзіця на дзьве часткі, і дайце адной палову, і другой
палову».

26 І сказала валадару жанчына, сын якой быў жывы, бо ўзрушыліся [літасьцю] да сына свайго
ўнутранасьці ейныя, і яна сказала: «Гаспадару мой, жывое дзіця аддайце ёй, але не забівайце
яго». А другая сказала: «Няхай ня будзе ён ані табе, ані мне. Расьськайце».
27 І адказаў валадар, і сказаў: «Дайце ёй жывое дзіця, і не забівайце яго, бо яна — маці ягоная».
28 І пачуў увесь Ізраіль пра гэты суд, як прысудзіў валадар; і баяліся перад абліччам валадара,
бо бачылі ў ім мудрасьць Божую, каб чыніць суд.

1 Вал 4

1 І быў валадар Салямон валадаром над усім Ізраілем.
2 І меў ён начальнікаў: Азарыю, сына Цадока, сьвятара,
3 Аліхарэфа і Ахію, сыноў Шышы, пісараў, і Язафата, сына Ахілюда, канцлера.
4 А Бэная, сын Егаяды, [быў] над войскам, а Цадок і Абіятар — сьвятарамі.
5 Азарыя, сын Натана, [быў] над намесьнікамі, Завуд, сын Натана, сьвятар, — сябрам валадара.
6 Ахішар — начальнікам над домам [валадара], а Аданірам, сын Абды, — над падаткамі.
7 І меў Салямон дванаццаць намесьнікаў над усім Ізраілем, і яны рупіліся пра харчы для
валадара і дому ягонага. Кожны з іх меў забясьпечваць харчы на адзін месяц у год.
8 Вось імёны іхнія: Бэн-Хур — на гары Эфраіма;
9 Бэн-Дэкэр — у Макацы і ў Шаальбіме, у Бэт-Шэмэшы, Элёне і Бэт-Ханане;
10 Бэн-Хэсэд — у Арубоце, да яго [належалі] Сахо і ўся зямля Хэфэр.
11 Бэн-Абінадаў, якому [належала] ўся ваколіца Дору, і Тафат, дачка Салямона, была жонкай
ягонай;
12 Баана, сын Ахілюда, — над Таанахам, Мэгіддо і над усім Бэт-Шэанам, які каля Цартаны,
ніжэй Езрээля, ад Бэт-Шэану аж да Абэль-Мэхо і аж да ваколіц Ёкмэаму.
13 Бэн-Гэбэр — у Рамоце Гілеадзкім, ён меў Хавот-Яір сыноў Манасы ў Гілеадзе, і ваколіцы
Аргобу ў Башане — шэсьцьдзясят вялікіх гарадоў з мурамі і мядзянымі засаўкамі;
14 Ахінадаў, сын Іддо, — у Маханаіме;
15 Ахімаац — у Нэфталі, ён таксама ўзяў за жонку Басэмат, дачку Салямона;
16 Баана, сын Хушая, — у Асэра і ў Бэалоце,
17 Язафат, сын Паруаха — у Ісахара,
18 Шымэй, сын Элы — у Бэн’яміна.
19 Гэбэр, сын Урыя — у зямлі Гілеад, у зямлі Сыгона, валадара Амарэйцаў, і Ога, валадара
Башану. І [быў] адзін намесьнік у [кожнай] зямлі.
20 Юда і Ізраіль былі шматлікія, як пясок марскі. Яны ўдосталь елі і пілі, і цешыліся.
21 І валодаў Салямон усімі валадарствамі ад ракі [Эўфрат] аж да зямлі Філістынцаў і аж да
межаў Эгіпту. Яны прыносілі яму дары і служылі Салямону ўсе дні жыцьця ягонага.
22 Харчаваньнем Салямона на кожны дзень [было]: трыццаць кораў найлепшае мукі і
шэсьцьдзясят кораў звычайнай мукі,
23 дзесяць кормных валоў і дваццаць валоў з пашы, і сто авечак, апрача аленяў, сарнаў,
антылёпаў і кормных птушак.
24 Ён панаваў над усім абшарам на гэты бок ракі [Эўфрат], ад Тыфсаху да Газы, і над усімі
валадарамі абшараў на гэты бок ракі. І меў ён супакой на ўсіх межах сваіх наўкола.
25 І Юда і Ізраіль жылі ў бясьпецы, кожны пад вінаградам сваім і пад дрэвам фігавым сваім ад
Дану да Бээр-Шэвы ў-ва ўсе дні Салямона.
26 І меў Салямон чатыры тысячы стайняў для коней для калясьніцаў сваіх і дванаццаць
тысячаў вершнікаў.
27 І намесьнікі дастаўлялі валадару Салямону і ўсім, хто набліжаўся да стала валадара
Салямона, усё неабходнае, кожны ў свой месяц, і не бракавала нічога.
28 А ячмень і салому для коней і дрыгантаў дастаўлялі на месца, якое было кожнаму
прызначанае.
29 І даў Бог Салямону вельмі вялікую мудрасьць і разважлівасьць, і шырокае сэрца, як пясок,
які на беразе мора.

30 І перавышала мудрасьць Салямона мудрасьць усіх сыноў Усходу і ўсю мудрасьць Эгіпту.
31 І быў ён мудрэйшы за ўсіх людзей, мудрэйшы за Этана Эзрахіта, Гэмана, Калькола і Дарду,
сыноў Махола, і было [слаўнае] імя ягонае ў-ва ўсіх навакольных народаў.
32 І расказаў ён тры тысячы прыказак, а сьпеваў ягоных было тысяча пяць.
33 І гаварыў ён пра дрэвы, [пачынаючы] ад кедраў, што на Лібане, аж да гізопу, што расьце на
муры. Гаварыў ён пра зьвяроў, пра птушак, пра паўзуноў і рыбаў.
34 І прыходзілі з усіх народаў паслухаць мудрасьці Салямона, і ад усіх валадароў зямлі, якія
чулі пра мудрасьць ягоную.

1 Вал 5

1 І паслаў Хірам, валадар Тыру, да Салямона слугаў сваіх, бо пачуў, што яго памазалі на
валадара на месца бацькі ягонага, бо Хірам быў сябрам Давіда ўсе дні [ягоныя].
2 І паслаў Салямон да Хірама, кажучы:
3 «Ты ведаеш, што Давід, бацька мой, ня мог пабудаваць Дом для імя ГОСПАДА, Бога свайго,
з прычыны войнаў, што атачалі яго, аж пакуль ГОСПАД не паклаў [ворагаў] пад стопы ног
ягоных.
4 І цяпер ГОСПАД, Бог мой, даў мне супакой з усіх бакоў, няма супраціўніка, няма нападзеньня
ліхога.
5 І вось, вырашыў я пабудаваць Дом для імя ГОСПАДА, Бога майго, як прамовіў ГОСПАД да
Давіда, бацькі майго, кажучы: “Сын твой, якому Я дам пасад твой пасьля цябе, ён пабудуе
Дом для імя Майго”.
6 І цяпер ты загадай насекчы для мяне кедраў з Лібану, а слугі мае няхай будуць разам са
слугамі тваімі. Я буду плаціць табе за слугаў тваіх, колькі ты скажаш. Бо ты ведаеш, што няма
ў нас чалавека, які б умеў секчы дрэвы так, як Сідонцы».
7 І калі пачуў Хірам словы Салямона, ён вельмі ўзрадаваўся і сказаў: «Дабраслаўлёны сёньня
ГОСПАД, Які даў Давіду сына мудрага над гэтым шматлікім народам».
8 І паслаў Хірам Салямону, кажучы: «Я пачуў тое, што ты мне пасылаў, і я выканаю кожнае
жаданьне тваё адносна дрэваў кедровых і кіпарысавых.
9 Слугі мае занясуць іх з Лібану да мора, а я паскладаю іх у плыты і [завязу] морам у месца,
якое ты мне вызначыш. Там я складу іх, а ты забярэш іх. І ты выканай жаданьне маё, даючы
хлеб дому майму».
10 І Хірам даваў Салямону дрэвы кедровыя і кіпарысавыя паводле жаданьня ягонага.
11 А Салямон даваў Хіраму дваццаць тысячаў кораў пшаніцы на харчаваньне дому ягонага і
дваццаць тысячаў кораў найчысьцейшага алею. Гэта даваў Салямон Хіраму штогод.
12 І даў ГОСПАД мудрасьць Салямону, як абяцаў яму. І быў мір між Хірамам і Салямонам, і яны
заключылі запавет між сабою.
13 І выбраў валадар Салямон работнікаў з усяго Ізраіля, і было работнікаў трыццаць тысячаў
чалавек.
14 І ён пасылаў іх у Лібан штомесяц па дзесяць тысячаў на зьмену; і месяц яны былі ў Лібане,
а два месяцы — дома, і Адонія [быў] над работнікамі.
15 І было ў Салямона семдзясят тысячаў тых, якія насілі цяжары, і восемдзясят тысячаў
каменяроў у гарах,
16 апрача трох тысячаў трохсот наглядчыкаў, вызначаных Салямонам наглядаць за народам,
які выконваў працу.
17 І загадаў валадар, каб яны дастаўлялі камяні вялікія, камяні каштоўныя для падмуркаў
Дому [Божага] з чэсаных камянёў.
18 І абчэсвалі іх работнікі Салямона і работнікі Хірама, і Гіўляне, і нарыхтоўвалі дрэва і камяні
на пабудову Дому [Божага].

1 Вал 6

1 У чатырыста восемдзясятым годзе пасьля выхаду Ізраілю з зямлі Эгіпецкай, у чацьвёртым
годзе валадараньня Салямона над Ізраілем, у месяцы Зіў, значыць другім месяцы, пачаў

[Салямон] будаваць Дом ГОСПАДА.
2 Дом, які валадар Салямон будаваў для ГОСПАДА, меў шэсьцьдзясят локцяў даўжыні, і дваццаць локцяў шырыні, і трыццаць локцяў вышыні.
3 Прысенак перад Дому Сьвятым меў дваццаць локцяў даўжыні, адпаведна да шырыні Дому, і дзесяць локцяў шырыні перад Домам.
4 І зрабіў ён у Доме [Божым]наўскосныя вокны з кратамі,
5 і зрабіў прыбудову ўздоўж сьценаў Дому, вакол Дому Сьвятога і Сьвятога Сьвятых, і бакавыя пакоі кругом.
6 І меў ніжні паверх пяць локцяў шырыні, сярэдні — шэсьць локцяў шырыні, а трэці — сем локцяў шырыні, бо ён зрабіў абмуроўку вакол Дому звонку, каб прыбудова не датыкалася да муроў Дому.
7 Пры пабудове Дому [Божага] бралі чэсаныя камяні, робленыя каменярамі, і ў Доме [Божым], калі яго будавалі, не было чутна ані молату, ані сякеры, ані ніякай прылады жалезнай.
8 Дзьверы ў сярэднія бакавыя пакоі былі з правага боку Дому, праз якія сходы ўзыходзілі да сярэдняга, а з сярэдняга — да трэцяга [паверху].
9 І пабудаваў [Салямон] Дом [Божы], і скончыў яго. І ашаляваў ён Дом дошкамі кедровымі.
10 І пабудаваў над усім Домам прыбудову ў пяць локцяў вышыні, і яна была прымацаваная да Дому бярвеньнямі кедровымі.
11 І было слова ГОСПАДА да Салямона, кажучы:
12 «Адносна Дому гэтага, які ты будуеш, дык калі ты будзеш хадзіць паводле пастановаў Мае, будзеш выконваць прысуды Мае і будзеш захоўваць прыказаньні Мае, каб хадзіць паводле іх, Я споўню слова Маё адносна цябе, якое прамовіў Давіду, бацьку твайму.
13 І Я буду жыць сярод сыноў Ізраіля, і не пакіну народу Майго, Ізраіля».
14 І пабудаваў Салямон Дом [Божы], і закончыў яго.
15 І знутры ашаляваў сьцены Дому дошкамі кедровымі, ад падлогі Дому аж да бэлькаў столі ўнутры ашаляваў дрэвам, а падлогу Дому пакрыў дошкамі кіпарысавымі.
16 А з задняга боку Дому паставіў сьцену з дошак кедровых у дваццаць локцяў вышыні ад падлогі, каб аддзяліць Давір, Сьвятое Сьвятых.
17 Сорак локцяў даўжыні меў Дом [Божы] ад пярэдняй часткі сьвятыні.
18 І былі [сьцены] кедровыя ўнутры ўпрыгожаныя рэзьбленымі пладамі і кветкамі. Усё было з кедру, і камяня не было відаць [на сьценах].
19 І Давір быў зроблены ў сярэдзіне Дому, каб там паставіць Каўчэг Запавету ГОСПАДА.
20 Давір меў дваццаць локцяў даўжыні, і дваццаць локцяў шырыні, і дваццаць локцяў вышыні. І [Салямон] ашаляваў яго чыстым золатам, і [пабудаваў] ахвярнік кедровы.
21 І ашаляваў Салямон Дом унутры шчырым золатам, і нацягнуў залатыя ланцугі перад Давірам, і ашаляваў яго золатам.
22 І ўвесь Дом ашаляваў золатам цалкам, і ахвярнік, які ў Давіры, ашаляваў золатам.
23 І зрабіў у Давіры двух херувімаў з дрэва аліўкавага ў дзесяць локцяў вышыні.
24 Адно крыло херувімаў мела пяць локцяў, і другое крыло мела таксама пяць локцяў. І ад канца аднаго крыла да канца другога крыла было дзесяць локцяў.
25 Другі херувім таксама меў дзесяць локцяў. Абодва херувімы мелі такія самыя памеры і выгляд.
26 Вышыня аднаго херувіма — дзесяць локцяў, і таксама другога херувіма.
27 І паставіў ён гэтых херувімаў у сярэдзіне ўнутранай часткі Дому. І крылы херувімаў былі раскінуты, і крыло аднаго херувіма дакраналася адной сьцяны, а крыло другога дакраналася другой сьцяны. А іхнія другія крылы зыходзіліся ў сярэдзіне Дому крыло з крылом.
28 І пакрыў ён херувімаў золатам.
29 А на ўсіх сьценах Дому кругом, унутры і звонку, выразаў выявы херувімаў, пальмаў і кветак, што красуюць.
30 І падлогу Дому пакрыў золатам унутры і звонку.
31 А на ўваходзе ў Давір зрабіў дзьверы з дрэва аліўкавага з пяцівугольнымі вушакамі.

32 І на дзьвюх паловах дзьвярэй з дрэва аліўкавага ён выразаў херувімаў, пальмы і кветкі, што
красуюць, і пакрыў іх золатам. І пакрыў золатам херувімаў і пальмы.
33 І гэтаксама зрабіў на ўваходзе ў сьвятыню чатырохвугольныя вушакі з дрэва аліўкавага,
34 і дзьве форткі дзьвярэй з дрэва кіпарысавага. Абедзьве форткі адных дзьвярэй былі
рухомыя, і абедзьве форткі другіх дзьвярэй былі рухомыя.
35 І выразьбіў на іх херувімаў, пальмы і кветкі, што красуюць, і пакрыў выявы золатам.
36 І аббудаваў ён унутраны панадворак трыма шэрагамі чэсаных камянёў і шэрагам
бярвеньняў кедровых.
37 У чацьвёртым годзе ў месяцы Зіў быў закладзены падмурак Дому ГОСПАДА,
38 а ў адзінаццатым годзе, у месяцы Буль, значыцца, у восьмым месяцы, быў скончаны
Дом [Божы] з усімі прыналежнасьцямі ягонымі і з усім упарадкаваньнем яго. Будаваў яго
[Салямон] сем гадоў.

1 Вал 7

1 А дом свой будаваў Салямон трынаццаць гадоў, і скончыў увесь дом свой.
2 І пабудаваў ён дом з лесу Лібанскага ў сто локцяў даўжыні, і пяцьдзясят локцяў шырыні,
і трыццаць локцяў вышыні, на чатырох шэрагах слупоў кедровых, і бэлькі кедровыя былі
паложаныя на слупы.
3 І быў [дом] ашаляваны кедрам над бэлькамі на сарака пяці слупах, па пятнаццаць у адным
шэрагу.
4 І вокны былі ў тры шэрагі: вакно над вакном праз тры крокі.
5 Усе дзьверы і вокны былі чатырохкутныя, вакно ад вакна праз тры крокі.
6 Зрабіў ён таксама прысенак са слупамі ў пяцьдзясят локцяў даўжыні і трыццаць локцяў
шырыні, і другія сені перад ім, і слупы, і паветку.
7 І зрабіў залю з пасадам, у якой судзіў, залю судовую, і ашаляваў яе дошкай кедровай ад
падлогі да столі.
8 А дом ягоны, у якім жыў, быў за домам з заляй на панадворку, асобна пабудаваны. І
пабудаваў ён дом, падобны да [дому] з заляй, для дачкі фараона, якую ўзяў за жонку.
9 Усё гэта знутры і звонку, ад падлогі аж да столі, і аж да вялікага панадворку, было з адборных
камянёў, чэсаных пад мерку і рэзаных пілою.
10 А падмурак быў з адборных камянёў, камянёў вялікіх, камянёў у дзесяць локцяў і камянёў
у восем локцяў.
11 А над падмуркам — адборныя камяні, чэсаныя пад мерку, і [дрэва] кедровае.
12 Вялікі панадворак атачалі тры шэрагі чэсаных [камянёў] і шэраг бярвеньняў кедровых, і ён
прылягаў да панадворку Дому ГОСПАДА і да дому з заляй [судовай].
13 І паслаў валадар Салямон, і ўзяў з Тыру Хірама,
14 сына жанчыны ўдавы з пакаленьня Нэфталі. Бацька ягоны, Тыранін, быў меднікам. І быў
ён поўны мудрасьці і розуму, і майстэрства ў-ва ўсякай рабоце на медзі. І прыйшоў ён да
валадара Салямона, і рабіў усе працы ягоныя.
15 І адліў ён два слупы мядзяныя: адзін — у васямнаццаць локцяў вышыні і дванаццаць локцяў
наўкола, і другі такі самы.
16 І зрабіў ён з медзі дзьве галавіцы, і зьмясьціў іх на версе слупоў. Адна галавіца мела пяць
локцяў вышыні, і пяць локцяў вышыні мела другая галавіца.
17 На галавіцах, якія былі на версе слупоў, зрабіў сплецівы з ланцужкоў мастацкай работы, сем
сплеціваў на адной галавіцы, і сем на другой галавіцы.
18 І зрабіў яблыкі гранатовыя па два шэрагі кругом кожнага сплеціва вакол галавіцы на версе
слупа. І такім самым спосабам аздобіў другі слуп.
19 Галавіцы, якія [былі] на версе слупоў у прысенку, мелі выгляд лілеі ў чатыры локці
[велічыні].
20 І галавіцы на абодвух слупах проста над выпукласьцю, якая па-за сплецівам, мелі дзьвесьце
яблыкаў гранатовых у шэрагах вакол адной і другоў галавіцы.

21 І паставіў ён слупы гэтыя ў прысенку сьвятыні. І паставіў слуп з правага боку, і назваў імя
ягонае Яхін, і паставіў слуп з левага боку, і назваў імя ягонае Боаз.
22 А на версе тых слупоў былі выявы лілеяў. І ён скончыў выраб гэтых слупоў.
23 І зрабіў ён з медзі мора, ад берагу да берагу дзесяць локцяў, круглае, у вышыню пяць локцяў,
і трыццаць локцяў наўкола.
24 Ніжэй краёў мора апаясвалі яго кругом выявы пладоў, па дзесяць на локаць кругом мора. І
ішлі яны ў два шэрагі, і былі адлітыя разам з морам.
25 [Мора] стаяла на дванаццаці валах. З іх тры глядзелі на поўнач, тры — на ўсход, тры — на
захад, а тры — на поўдзень. Мора было на іх, а азадкі іхнія [зьвернутыя] ў сярэдзіну.
26 Таўшчыня [мора] — у далонь, а берагі яго зробленыя ў выглядзе берагоў келіха, як кветкі
лілеі; зьмяшчала яно дзьве тысячы батаў.
27 І зрабіў ён дзесяць мядзяных падставаў; кожная падстава мела чатыры локці даўжыні,
чатыры локці шырыні і тры локці вышыні.
28 Падставы гэтыя былі зроблены так: мелі яны ліштвы, і пруты між ліштвамі.
29 А на тых ліштвах між прутамі — ільвы, валы і херувімы. А на прутах, над і пад ільвамі і
валамі зроблены гірлянды, што вісяць.
30 Кожная падстава мела чатыры мядзяныя колы на мядзяных восях. А іхнія чатыры рагі мелі
рамёны пад мыцельнікам. Рамёны гэтыя адлітыя былі з кожнага боку гірляндаў.
31 Паміж рамёнамі меў ён адтуліну на вышыні локця, круглую, на паўтары локці. Вакол
адтуліны былі таксама выявы, а ліштвы ейныя былі ня круглыя, але чатырохкутныя.
32 І чатыры колы былі пад ліштвамі, а восі колаў былі прымацаваныя пры падставах. Вышыня
кола была ў паўтары локці.
33 Колы былі зробленыя, як робіцца кола для возу. Восі іхнія, абады іхнія, і ступіцы іхнія, усё
было адлітае.
34 На чатырох рагах кожнае падставы былі чатыры рамёны, і рамёны былі адно цэлае з
падставай.
35 На версе падставы кругом на паўлокці было закругленьне, а на версе закругленьня — ручкі
ягоныя і ліштвы ягоныя.
36 І на ўсіх бляхах і прутах выразьбіў ён кругом херувімаў, ільвоў і пальмы.
37 У такі спосаб зрабіў ён дзесяць мядзяных падставаў, аднолькавага ліцьця, аднолькавага
памеру і аднолькавага выгляду.
38 Зрабіў ён таксама дзесяць мыцельнікаў мядзяных, а кожны мыцельнік зьмяшчаў сорак
батаў. Кожны мыцельнік меў чатыры локці, і кожны з іх быў на адной з дзесяці падставаў.
39 Пяць падставаў памясьціў ён на правым баку Дому [Божага] і пяць — на левым баку Дому
[Божага]. А мора памясьціў на паўднёвы ўсход на правым баку Дому [Божага].
40 І зрабіў Хірам мыцельнікі, шуфлікі і крапільніцы. І скончыў Хірам усе працы, якія меў
зрабіць для валадара Салямона ў Доме ГОСПАДА:
41 два слупы і круглыя галавіцы на версе тых двух слупоў, два сплеціва на прыкрыцьцё двух
круглых галавіцаў на версе тых слупоў,
42 чатырыста яблыкаў гранатовых на абедзьвух сплецівах, па два шэрагі яблыкаў на кожным
сплеціве,
43 дзесяць падставаў і дзесяць мыцельнікаў на тых падставах,
44 і адно мора, і дванаццаць валоў пад ім,
45 і казаны, шуфлікі і крапільніцы. І ўсе прылады, якія Хірам зрабіў валадару Салямону ў Дом
ГОСПАДА, былі з палераванай медзі.
46 Ён адліваў усё гэта ў гліне над Ярданам, між Сукотам і Цартанам.
47 І парастаўляў Салямон усе гэтыя прылады. І было іх так шмат, што вагі медзі нельга было
палічыць.
48 І зрабіў Салямон усе прылады ў Дом ГОСПАДА: ахвярнік залаты і стол залаты, на які
[лажылі] хлябы пакладныя,
49 і сьвечнікі з чыстага золата: пяць сьвечнікаў з правага боку і пяць сьвечнікаў з левага боку
насупраць Давіру, і кветкі, лямпы, шчыпцы з золата,

50 і місы, нажніцы, крапільніцы са шчырага золата, і залатыя завесы да дзьвярэй Дому ўнутры,
да [дзьвярэй] Сьвятога Сьвятых і да дзьвярэй Дому Сьвятога.
51 І скончана была ўся праца, якую зрабіў валадар Салямон у Доме ГОСПАДА. І прынёс Салямон
пасьвячоныя бацькам сваім, Давідам, рэчы: срэбра, золата і посуд, і памясьціў іх у скарбніцы
Дому ГОСПАДА.

1 Вал 8

1 Тады сабраў Салямон старшыняў Ізраіля, усіх князёў пакаленьняў, усіх начальнікаў [дамоў]
бацькоў сыноў Ізраіля да валадара Салямона ў Ерусалім, каб перанесьці Каўчэг Запавету
ГОСПАДА з гораду Давіда, з Сыёну.
2 І сабраўся да валадара Салямона ўсе Ізраільцяне ў месяцы Этанім на сьвята, якое ў сёмым
месяцы.
3 І прыйшлі ўсе старшыні Ізраіля, і сьвятары ўзялі Каўчэг,
4 і перанесьлі Каўчэг ГОСПАДА, Намёт Спатканьня і ўсе рэчы сьвятыя, якія [былі] ў Намёце, і
несьлі іх сьвятары і лявіты.
5 І валадар Салямон, і ўся грамада Ізраіля, якая сабралася пры ім, ішлі перад Каўчэгам і
складалі ахвяры з авечак і валоў так шмат, што ані запісаць, ані палічыць нельга было.
6 І ўнесьлі сьвятары Каўчэг Запавету ГОСПАДА ў Давір сьвятыні, у Сьвятое Сьвятых, пад крылы
херувімаў.
7 Бо херувімы раскінулі крылы над месцам Каўчэгу і закрывалі херувімы Каўчэг і насілы
ягоныя зьверху.
8 Насілы гэтыя былі такія доўгія, што канцы іхнія былі бачныя з [Месца] Сьвятога перад
Давірам, але не было іх бачна звонку. І яны там аж да гэтага дня.
9 У Каўчэгу не было нічога, акрамя дзьвюх каменных табліцаў, якія туды палажыў Майсей пад
Харэвам, калі ГОСПАД заключыў запавет з сынамі Ізраіля пад час выхаду іх з зямлі Эгіпецкай.
10 І сталася, калі сьвятары выйшлі са сьвятыні, воблака запоўніла Дом ГОСПАДА.
11 І не маглі сьвятары стаяць і спаўняць службу з прычыны гэтага воблака, бо слава ГОСПАДА
напоўніла Дом ГОСПАДА.
12 Тады сказаў Салямон: «ГОСПАД сказаў, што будзе жыць у хмары.
13 Я пабудаваў Дом на пражываньне Табе, месца знаходжаньня Твайго на вякі».
14 І павярнуў валадар аблічча сваё, і дабраславіў усю царкву Ізраіля, а ўся царква Ізраіля стаяла.
15 І ён сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які прамовіў вуснамі Сваімі Давіду, бацьку
майму, і зьдзейсьніў гэта рукою Сваёю, кажучы:
16 “Ад таго дня, у які Я вывеў народ Мой, Ізраіля, з Эгіпту, з усіх пакаленьняў Ізраіля ня выбраў
Я гораду для пабудовы Дому, каб імя Маё было там, але Я выбраў Давіда, каб быў ён над
народам Маім, Ізраілем”.
17 І было ў сэрцы Давіда, бацькі майго, пабудаваць Дом для імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
18 Але ГОСПАД сказаў Давіду, бацьку майму: “Тое, што ты задумаў у сэрцы тваім, каб
пабудаваць Дом для імя Майго, добра ты зрабіў, што гэта ў сэрцы тваім.
19 Аднак ты не пабудуеш Дом гэты, але сын твой, які выйдзе з паясьніцы тваёй, ён пабудуе
Дом для імя Майго”.
20 І зьдзейсьніў ГОСПАД слова Сваё, якое прамовіў. І я заняў месца Давіда, бацькі майго, і сеў
на пасадзе Ізраіля, як прамовіў ГОСПАД. І я пабудаваў Дом для імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
21 І там я падрыхтаваў месца для Каўчэга, у якім Запавет ГОСПАДА, які Ён заключыў з бацькамі
нашымі, калі вывеў іх з зямлі Эгіпецкай».
22 І стаў Салямон перад ахвярнікам ГОСПАДА, і перад усёй царквой Ізраіля выцягнуў рукі свае
да неба, і сказаў:
23 «ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля! Няма падобнага Табе Бога ані ў небе ўгары, ані на зямлі ўнізе. Ты
захоўваеш запавет і міласэрнасьць для слугаў Тваіх, якія ходзяць перад абліччам Тваім усім
сэрцам сваім.
24 Ты споўніў слузе Твайму, Давіду, бацьку майму, тое, што прамовіў яму. Тое, што Ты
прамовіў вуснамі Тваімі, сёньня Ты зьдзейсьніў рукою Тваёю.

25 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, споўні слузе Твайму Давіду, бацьку майму, тое, што Ты
прамовіў яму, кажучы: “Ня будзе забраны ў цябе чалавек ад аблічча Майго, які будзе сядзець
на пасадзе Ізраіля, калі сыны твае будуць захоўваць шлях Мой, каб хадзіць перад абліччам
Маім, як ты хадзіў перад абліччам Маім”.
26 І цяпер, Божа Ізраіля, няхай спраўдзяцца словы Твае, якія Ты гаварыў слузе Твайму, Давіду,
бацьку майму.
27 Ці ж сапраўды Бог будзе жыць на зямлі? Вось, неба і нябёсы нябёсаў ня могуць ахапіць Цябе.
Што ж тады Дом гэты, які я пабудаваў?
28 Але Ты зваж на малітву слугі Твайго і на просьбы ягоныя, ГОСПАДЗЕ, Божа мой. Пачуй
кліканьне і малітву, якімі моліцца перад абліччам Тваім сёньня слуга Твой.
29 Няхай будуць вочы Твае адкрытыя на Дом гэты ўдзень і ўначы, на месца, пра якое Ты казаў:
“Там імя Маё”, і выслухай малітву, якою моліцца слуга Твой на месцы гэтым.
30 І выслухай маленьні слугі Твайго і народу Твайго Ізраіля, якія будуць маліцца на месцы
гэтым. І ты пачуй з месца знаходжаньня Твайго ў небе, пачуй і прабач.
31 Калі саграшыць чалавек супраць бліжняга свайго, і будуць вымагаць ад яго прысягі, каб ён
прысягнуў перад ахвярнікам Тваім, і будзе адбывацца прысяга ў Доме гэтым,
32 Ты пачуй з неба, і зрабі [суд], і судзі слугаў Тваіх, асуджаючы бязбожнага, каб на
галаву ягоную зьвярнуліся шляхі ягоныя, і апраўдваючы праведнага, даючы яму паводле
праведнасьці ягонай.
33 Калі народ Твой, Ізраіль, будзе пабіты перад абліччам ворага за тое, што ён саграшыў
адносна Цябе, і яны навернуцца да Цябе, і будуць клікаць імя Тваё, і будуць маліцца і прасіць
Цябе ў Доме гэтым,
34 Ты пачуй з неба, і прабач грэх народу Твайго, Ізраіля, і вярні іх у зямлю, якую Ты даў бацькам
іхнім.
35 Калі будзе замкнёнае неба і ня будзе дажджу, бо яны саграшылі перад Табою, і яны будуць
маліцца на месцы гэтым і клікаць імя Тваё, і адвернуцца ад грэху свайго, бо Ты пакараў іх,
36 Ты пачуй з неба і прабач грэх слугаў Тваіх і народу Твайго, Ізраіля, навучыўшы іх шляху
добраму, па якім яны маюць ісьці, і спашлі дождж на зямлю Тваю, якую Ты даў народу Твайму
ў спадчыну.
37 Калі будзе голад на зямлі, або будзе пошасьць, або будзе суша, іржа, саранча, або чэрві, або
будзе вораг ягоны прыгнятаць яго ў зямлі, дзе брамы ягоныя, або [прыйдзе] якая кара або якая
хвароба,
38 кожную малітву, кожнае маленьне, якое будзе ад нейкага чалавека або ад усяго народу
Твайго, Ізраіля, калі кожны з іх адчуе плягуў сэрцы сваім, і выцягне далоні свае да Дому гэтага,
39 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго, і прабач, і зрабі [суд], і дай кожнаму паводле
ўсіх шляхоў ягоных, бо Ты ведаеш сэрца ягонае, бо толькі Ты адзін ведаеш сэрцы ўсіх сыноў
чалавечых,
40 каб яны баяліся Цябе ў-ва ўсе дні, пакуль жывуць на абліччы зямлі, якую Ты даў бацькам
нашым.
41 Таксама калі чужынец, які не з народу Твайго, Ізраіля, прыйдзе з зямлі далёкай дзеля імя
Твайго,
42 бо яны пачуюць пра імя Тваё вялікае, і руку Тваю моцную, і рамяно Тваё ўзьнятае, і прыйдзе
ён, і будзе маліцца ў Доме гэтым,
43 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго, і зрабі ўсё, пра што прасіць Цябе будзе
чужынец, каб ведалі ўсе народы зямлі імя Тваё і баяліся Цябе, як народ Твой, Ізраіль, і каб
ведалі, што імя Тваё заклікаецца над Домам гэтым, які я пабудаваў.
44 Калі выйдзе народ Твой на вайну супраць ворагаў сваіх шляхам, якім Ты іх пашлеш, і яны
будуць маліцца да ГОСПАДА ў накірунку гораду, які Ты выбраў, і Дому, які я пабудаваў для імя
Твайго,
45 Ты пачуй з неба малітву іхнюю і маленьне іхняе, і ўчыні суд для іх.
46 Калі яны саграшаць перад Табою, а няма чалавека, які не саграшыў бы, і Ты загневаешся на
іх, і аддасі іх ворагам, і яны возьмуць іх у няволю ў зямлю ворагаў далёкую або блізкую,

47 і калі яны схамянуцца ў сэрцы сваім у зямлі, у якой будуць палоненыя, і навернуцца, і
будуць прасіць Цябе ў зямлі няволі сваёй, кажучы: “Саграшылі мы, і правініліся, бо былі
бязбожнікамі”,
48 і навернуцца да Цябе ўсім сэрцам сваім і ўсёю душою сваёй у зямлі ворагаў сваіх, у якой
паланілі іх, і будуць маліцца да Цябе, павярнуўшыся ў бок зямлі сваёй, якую Ты даў бацькам
іхнім, і да гораду, які Ты выбраў, і да Дому гэтага, які я пабудаваў для імя Твайго,
49 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго малітву іхнюю і маленьне іхняе, і ўчыні суд
для іх,
50 і прабач народу Твайму, які саграшыў перад Табою, усе праступкі іхнія, якімі яны
правініліся адносна Цябе, і зьяві ім літасьць перад абліччам тых, якія ўзялі іх у палон, каб
яны зьлітаваліся над імі,
51 бо яны — народ Твой і спадчына Твая, бо Ты вывеў іх з Эгіпту, з сярэдзіны печы жалезнай.
52 Няхай вочы Твае будуць адкрытыя на маленьне слугі Твайго і на маленьне народу Твайго,
Ізраіля, і Ты выслухай іх у-ва ўсім, пра што яны клічуць да Цябе.
53 Бо Ты выбраў іх з усіх народаў зямлі ў спадчыну Сабе, як Ты прамовіў праз Майсея, слугу
Твайго, калі Ты, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, вывеў бацькоў нашых з Эгіпту».
54 І сталася, калі Салямон скончыў малітву гэтую і просьбу да ГОСПАДА, ён устаў спрад
ахвярніка ГОСПАДА, бо быў схіліўшыся на калені свае, а рукі ягоныя былі ўзьнятыя ў неба.
55 І ўстаў ён, і дабраславіў усю царкву Ізраіля голасам вялікім, кажучы:
56 «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Які даў супакой усяму народу Свайму, Ізраілю, паводле ўсяго, што
Ён прамовіў. І споўнілася кожнае добрае слова, якое Ён сказаў праз Майсея, слугу Свайго.
57 Няхай будзе ГОСПАД, Бог наш, з намі, як быў з бацькамі нашымі. Няхай Ён не пакіне нас і не
адкіне нас.
58 Няхай Ён прыхіліць сэрцы нашыя да Сябе, каб мы хадзілі ўсімі шляхамі Ягонымі, захоўвалі
прыказаньні Ягоныя, пастановы Ягоныя і прысуды Ягоныя, якія Ён загадаў бацькам нашым.
59 І няхай будуць словы гэтыя, якімі я маліўся перад абліччам ГОСПАДА, блізкія ГОСПАДУ,
Богу нашаму, удзень і ўначы, каб Ён чыніў суд слузе Свайму і суд народу Свайму, Ізраілю, у
[кожнай] справе штодзень,
60 каб ведалі ўсе народы зямлі, што толькі ГОСПАД ёсьць Бог, і няма іншага.
61 І няхай будзе сэрца вашае шчырым з ГОСПАДАМ, Богам нашым, каб вы хадзілі паводле
пастановаў Ягоных і захоўвалі прыказаньні Ягоныя, як [гэта ёсьць] сёньня».
62 І валадар і ўвесь Ізраіль разам з ім складалі ахвяры перад абліччам ГОСПАДА.
63 І Салямон склаў як ахвяру мірную, якую ахвяраваў ГОСПАДУ, дваццаць дзьве тысячы валоў
і сто дваццаць тысячаў авечак. І асьвяцілі Дом ГОСПАДА валадар і ўсе сыны Ізраіля.
64 У той дзень валадар асьвяціў унутраную частку панадворку, які быў перад Домам ГОСПАДА,
бо склаў там ахвяру цэласпаленьня, ахвяру хлебную і тлушч ахвяраў мірных, бо ахвярнік
мядзяны, які перад абліччам ГОСПАДА, быў замалы для ўсіх цэласпаленьняў, і ахвяраў
хлебных, і тлушчу ахвяраў мірных.
65 І ў той час Салямон і ўвесь Ізраіль з ім, вялікая царква, што сабралася ад уваходу ў Хамат аж
да ручая Эгіпецкага перад абліччам ГОСПАДА, Бога нашага, сьвяткавалі сьвята сем дзён і сем
дзён, разам чатырнаццаць дзён.
66 У восьмы дзень ён адпусьціў народ, і яны дабраславілі валадара, і вярнуліся ў намёты свае,
радасныя і з добрым сэрцам з прычыны ўсіх дабрадзействаў, якія зрабіў ГОСПАД Давіду, слузе
Свайму, і Ізраілю, народу Свайму.

1 Вал 9

1 І сталася, калі Салямон скончыў будаваць дом ГОСПАДА і дом валадара, і ўсё, што Салямон
задумаў і хацеў зрабіць,
2 зьявіўся Салямону ГОСПАД другі раз, як быў аб’явіўшыся яму ў Гібэоне.

3 І сказаў ГОСПАД яму: «Я пачуў малітву тваю і маленьне тваё, якія ты прыносіў да Мяне, і Я
асьвяціў Дом гэты, які ты пабудаваў, каб было там імя Маё на вякі. І будуць там вочы Мае і
сэрца Маё ў-ва ўсе дні.
4 Таксама ты, калі будзеш хадзіць перад абліччам Маім, як хадзіў Давід, бацька твой, у чысьціні
сэрца і ў справядлівасьці, і будзеш выконваць усё, што Я загадаў табе, калі захаваеш прысуды
Мае і пастановы Мае,
5 Я пастаўлю пасад валадараньня твайго над Ізраілем на вякі, як Я прамовіў Давіду, бацьку
твайму, кажучы: “Ня будзе адкінуты ў цябе чалавек ад пасаду Ізраіля”.
6 А калі адвернецеся ад Мяне вы і сыны вашыя, і ня будзеце захоўваць прыказаньні Мае і
пастановы Мае, якія Я даў вам, і пойдзеце, і будзеце служыць багам чужым, і пакланяцца ім,
7 Я зьмяту Ізраіля з аблічча зямлі, якую Я даў ім, і Дом, які Я асьвяціў для імя Майго, адкіну ад
аблічча Майго. І станецца Ізраіль у прыказку і насьмешку ўсім народам,
8 а Дом гэты будзе купай друзу. Кожны, хто пройдзе каля яе, зьдзівіцца, і засьвішча, і скажа:
“Чаму ГОСПАД зрабіў гэта зямлі гэтай і Дому гэтаму?”
9 І скажуць: “За тое, што яны пакінулі, ГОСПАДА, Бога свайго, Які вывеў бацькоў іхніх з зямлі
Эгіпецкай, а яны прытуліліся да багоў чужых, і пакланяліся ім, і служылі ім. Дзеля гэтага
ГОСПАД спаслаў на іх усё гэтае зло”».
10 І сталася праз дваццаць гадоў, у якія Салямон будаваў два дамы, Дом ГОСПАДА і дом
валадара,
11 а Хірам, валадар Тыру, даваў Салямону дрэва кедровае і кіпарысавае, і золата, усё, што
[Салямон] патрабаваў, валадар Салямон даў Хіраму дваццаць гарадоў у зямлі Галілейскай.
12 І выйшаў Хірам з Тыру паглядзець гарады, якія даў яму Салямон, і не спадабаліся яны вачам
ягоным.
13 І сказаў ён: «Што гэта за гарады, якія ты мне даў, браце мой?» І назваў ён іх зямлёй Кабуль
аж да гэтага дня.
14 І паслаў Хірам валадару сто дваццаць талентаў золата.
15 Гэта велічыня падатку для працы, які вызначыў валадар Салямон, каб пабудаваць Дом
ГОСПАДА і дом свой, і Мілло, і мур Ерусаліму, і Хацор, і Мэгіддо, і Гэзэр.
16 Фараон, валадар Эгіпту, калісьці напаў, і здабыў Гэзэр, і спаліў яго агнём, а Хананейцаў,
жыхароў гораду, забіў. І аддаў гэты горад у пасагу дачцэ сваёй, жонцы Салямона.
17 І Салямон адбудаваў Гэзэр і Ніжні Бэт-Харон,
18 і Баалат, і Тамар у пустыні,
19 і ўсе гарады сьвірнаў, якія належалі салямону, і гарады для калясьніцаў, і гарады для
коньнікаў, і ўсё, што надумаў Салямон, каб пабудаваць у Ерусаліме, у Лібане і ў-ва ўсёй зямлі
панаваньня ягонага.
20 Увесь народ, які застаўся з Амарэйцаў, Хетаў, Пэрэзэяў, Хівеяў і Евусэяў, якія не былі з сыноў
Ізраіля,
21 сыноў іхніх, якія засталіся ў зямлі і якіх сыны Ізраіля ня зьнішчылі, Салямон прызначыў для
працаў нявольнічых да гэтага дня.
22 А з сыноў Ізраіля Салямон не зрабіў нікога нявольнікам, але былі яны ваярамі ягонымі,
слугамі ягонымі, князямі ягонымі, вартай ягонай, возьнікамі калясьніцаў ягоных і коньнікамі
ягонымі.
23 Тых князёў, якія [былі] наглядчыкамі над працамі Салямона, [было] пяцьсот пяцьдзясят.
Яны наглядалі над людзьмі, якія выконвалі працу.
24 Калі дачка фараона перайшла з гораду Давіда ў дом свой, які пабудаваў ёй Салямон, тады
ён пабудаваў Мілло.
25 Тры разы ў год Салямон складаў ахвяры цэласпаленьня і ахвяры мірныя на ахвярніку, які
ён пабудаваў для ГОСПАДА, і кадзіў там перад абліччам ГОСПАДА, калі скончыў Дом [Божы].
26 І пабудаваў валадар Салямон караблі ў Эцыён-Гэбэры каля Эляту на беразе Мора Чырвонага
ў зямлі Эдом.
27 І паслаў Хірам на караблі тыя слугаў сваіх, маракоў, абазнаных у моры, разам са слугамі
Салямона.

28 І яны прыйшлі ў Афір, і ўзялі адтуль золата чатырыста дваццаць талентаў, і прывезьлі яго
валадару Салямону.

1 Вал 10

1 І пачула валадарка Шэвы пра славу Салямона ў імя ГОСПАДА, і прыйшла выспрабаваць яго
пытаньнямі.
2 І ўвайшла яна ў Ерусалім з вельмі вялікай дружынай, з вярблюдамі, якія несьлі пахошчы, з
вялікім мноствам золата і каштоўных камянёў. І прыйшла яна да Салямона, і гаварыла з ім
пра ўсё, што мела яна ў сэрцы сваім.
3 І Салямон адказаў на ўсе словы ейныя, і не было нічога, што было схавана перад валадаром,
на што ён ня мог адказаць ёй.
4 І ўбачыла валадарка Шэвы ўсю мудрасьць Салямона, і дом, які ён пабудаваў,
5 і багацьце ежы на стале ягоным, і дамы слугаў ягоных, і паставу паслугачоў ягоных, і
адзеньне іхняе, і чашнікаў ягоных, і цэласпаленьні, якія ён складаў у Доме ГОСПАДА, і была
яна ў захапленьні.
6 І сказала яна валадару: «Праўдзівым было тое слова, якое я чула ў зямлі маёй, пра справы
твае і пра мудрасьць тваю!
7 Я ня верыла тым словам, пакуль сама не прыйшла і ня ўбачыла вачыма сваімі, і вось, нават
паловы не распавялі мне. Большая мудрасьць твая і багацьці, чым тая слава, якую я чула.
8 Шчаслівыя людзі твае і шчаслівыя слугі твае, якія стаяць перад абліччам тваім і заўсёды
чуюць мудрасьць тваю!
9 Няхай будзе дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог твой, Якому ты спадабаўся і Які пасадзіў цябе на
пасадзе Ізраіля, таму што любіць ГОСПАД Ізраіля на вякі, і Ён паставіў цябе валадаром, каб ты
чыніў суд і праведнасьць».
10 І дала яна валадару сто дваццаць талентаў золата, і вельмі шмат пахошчаў і каштоўных
камянёў, і не было ніколі падаравана больш пахошчаў, чым падаравала валадарка Шэвы
валадару Салямону.
11 Таксама караблі Хірама, якія прывозілі з Афіру золата, прывозілі з Афіру мноства чырвонага
дрэва і каштоўных камянёў.
12 З дрэва чырвонага валадар зрабіў парэнчы для Дому ГОСПАДА і для дому валадара, і гусьлі,
і псалтыры для сьпевакоў. І ніколі не было прывезена так шмат дрэва чырвонага, і не было
бачана такога аж да сёньня.
13 І валадар Салямон даў валадарцы Шэвы ўсё, што яна хацела і прасіла ў яго, апрача таго, што
ён даў ёй паводле [шчодрасьці] рукі валадара Салямона. І вярнулася яна, і пайшла ў зямлю
сваю, яна і слугі ейныя.
14 І была вага золата, якое штогод прыносілі Салямону, шэсьцьсот шэсьцьдзясят шэсьць
талентаў золата,
15 апрача таго, што прыходзіла праз падаткі ад гандляроў, і ад купцоў, і ад усіх валадароў
Арабскіх, і ад намесьнікаў у зямлі [Ізраіля].
16 І зрабіў валадар Салямон дзвесьце вялікіх шчытоў са шчырага золата, шэсьцьсот [сыкляў]
золата пайшло на кожны шчыт,
17 і трыста малых шчытоў са шчырага золата, тры міны золата пайшло на кожны шчыт. І
паставіў іх валадар у доме з лесу Лібанскага.
18 І зрабіў валадар вялікі пасад з косьці слановай, і пацягнуў яго чыстым золатам.
19 Да пасаду падыходзіла шэсьць прыступак, а верх пасаду быў ззаду круглы, і парэнчы на
абодвух баках пасаду, а пры парэнчах стаялі два ільвы.
20 І на шасьці прыступках з абодвух бакоў стаяла дванаццаць ільвоў. І ні ў адным валадарстве
не было зроблена нічога падобнага.
21 І ўсе пасудзіны, з якіх піў валадар Салямон, [былі] залатыя. І ўвесь посуд у доме з лесу
Лібанскага быў з чыстага золата. Нічога не было са срэбра, бо ня мела яно ніякай [вартасьці]
ў часы Салямона,

22 бо караблі Таршышу, якія меў у моры валадар разам з караблямі Хірама, раз у тры гады
прыходзілі з Таршышу, і прывозілі золата, срэбра, косьць слановую, малпаў і паваў.
23 І перавышаў валадар Салямон багацьцем і мудрасьцю ўсіх валадароў зямлі.
24 І [людзі] з усёй зямлі шукалі [слова] з вуснаў Салямона, каб паслухаць мудрасьць ягоную,
якую даў Бог у сэрца ягонае.
25 І кожны з іх прыносіў яму дары: посуд срэбны і посуд залаты, адзеньне, зброю, пахошчы,
коней, мулаў кожны год.
26 І памножыў Салямон калясьніцы і коньнікаў, і меў ён тысячу чатырыста калясьніцаў і
дванаццаць тысячаў коньнікаў. І разьмясьціў ён іх па гарадах калясьнічых і пры валадары
ў Ерусаліме.
27 А срэбра назьбіраў валадар у Ерусаліме столькі, колькі камянёў, і кедраў так шмат, колькі
сыкамораў у Шэфэлі.
28 І прыводзілі Салямону коней з Эгіпту і з Куэ, і купцы валадарскія куплялі [коней] па
вызначаным кошце.
29 І калясьніца з Эгіпту, прывезеная і вывезеная, каштавала шэсьцьсот [сыкляў] срэбра, а конь
— сто пяцьдзясят. Такім чынам праз рукі іхнія прадавалася ўсё гэта ўсім валадарам Хетаў і
валадарам Сірыі.

1 Вал 11

1 І валадар Салямон кахаў шмат жанчынаў чужынскіх, і дачку фараона, і Мааўлянак, і
Аманянак, і Эдомак, і Сідонак, і Хетак,
2 з тых народаў, пра якія ГОСПАД сказаў сынам Ізраіля: «Не ўваходзьце да іх, і яны няхай не
ўваходзяць да вас, бо яны прывабяць сэрцы вашыя да багоў іхніх». І да іх прыхіліўся Салямон
каханьнем.
3 І меў ён семсот жонак княгіняў і трыста наложніцаў. І жонкі ягоныя прывабілі сэрца ягонае.
4 Калі быў ён ужо стары, жонкі ягоныя прывабілі сэрца ягонае да багоў чужых, і сэрца ягонае
не было аддадзенае ГОСПАДУ, Богу ягонаму, як сэрца Давіда, бацькі ягонага.
5 І стаў Салямон хадзіць за Астартай, багіняй Сідонцаў, і за Мількомам, брыдотай Аманянаў.
6 І рабіў Салямон ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і ня быў цалкам з ГОСПАДАМ як Давід, бацька ягоны.
7 І тады пабудаваў Салямон ахвярнік для Кемоша, брыдоты Мааўскай, на гары насупраць
Ерусаліму, і для Малек, брыдоты сыноў Амона.
8 І тое самае зрабіў ён усім сваім жонкам чужынкам, палячы кадзіла і складаючы ахвяры багам
іхнім.
9 І загневаўся ГОСПАД на Салямона за тое, што ён адвярнуў сэрца сваё ад ГОСПАДА, Бога
Ізраіля, Які зьяўляўся яму двойчы
10 і загадаў яму не хадзіць за багамі чужымі. Але ён не захаваў таго, што загадаў ГОСПАД.
11 І сказаў ГОСПАД Салямону: «За тое, што ты [зрабіў] гэтае і не захаваў запавету Майго і
пастановаў Маіх, якія Я загадаў табе, Я, забіраючы, забяру валадараньне ад цябе і аддам яго
слузе твайму.
12 У дні твае, аднак, не зраблю гэтага дзеля Давіда, бацькі твайго, але з рукі сына твайго забяру
яго.
13 І ўсё валадарства не забяру, але адно пакаленьне дам сыну твайму дзеля Давіда, слугі Майго,
і дзеля Ерусаліму, які Я выбраў».
14 І паставіў ГОСПАД супраціўніка Салямону, Гадада Эдомца, з насеньня валадароў, якія [былі]
ў Эдоме.
15 Калі Давід перамог Эдом, Ёаў, начальнік войска, прыйшоў хаваць забітых і выбіў усіх
мужчынаў Эдомскіх,
16 бо быў там Ёаў і ўвесь Ізраіль шэсьць месяцаў, аж пакуль ня выбілі ўсіх мужчынаў у Эдоме.
17 І ўцёк Гадад, ён і Эдомцы, слугі бацькі ягонага, з ім, і зыйшоў у Эгіпет, а Гадад быў яшчэ
малым хлопцам.
18 І выйшлі яны з Мадыяну, і прыйшлі ў Паран, і ўзялі з сабою людзей з Парану, і прыйшлі ў
Эгіпет да фараона, валадара Эгіпецкага. А ён даў ім дом і харчаваньне і выдзяліў яму зямлю.

19 І знайшоў Гадад вялікую ласку ў вачах фараона, і ён даў Гададу за жонку сястру жонкі сваёй,
сястру валадаркі Тахпэнэс.
20 І сястра Тахпэнэс нарадзіла яму Гэнубата, сына ягонага. І Тахпэнэс выгадавала яго ў доме
фараона. І быў Гэнубат разам з сынамі фараона ў доме фараона.
21 І пачуў Гадад у Эгіпце, што Давід заснуў з бацькамі сваімі і што памёр Ёаў, начальнік войска,
і сказаў Гадад фараону: «Дазволь мне вярнуцца ў зямлю сваю».
22 Фараон сказаў яму: «Ці табе чаго не хапае ў мяне, што ты хочаш ісьці ў зямлю сваю?» Ён
адказаў: «Няма [недахопу], але прашу, адпусьці мяне».
23 І паставіў Бог яшчэ супраціўніка [Салямону], Рэзона, сына Эліяды, які ўцёк ад Гададэзэра,
валадара Цовы, гаспадара свайго.
24 Ён сабраў да сябе людзей і стаўся правадыром аддзелу. І калі Давід перамог іх, яны пайшлі
ў Дамаск, і там жылі, і валадарылі ў Дамаску.
25 І быў ён супраціўнікам Ізраіля ў-ва ўсе дні Салямона. І ненавідзеў ён Ізраіля, як і Гадад, і ён
валадарыў у Сірыі.
26 І Ерабаам, сын Навата, Эфрацянін з Цэрэды, маці ягоная мела на імя Цэруя, удава. Гэты
слуга Салямона падняў руку на валадара.
27 І вось такая была прычына, што ён падняў руку на валадара. Салямон будаваў Мілло і
замураваў вылом [у муры] ў горадзе Давіда, бацькі свайго.
28 А Ерабаам быў ваяр мужны. І бачыў Салямон юнака, што ён выконвае працу, і паставіў яго
наглядчыкам над усімі работнікамі з дому Язэпа.
29 І сталася ў той час, што Ерабаам выйшаў з Ерусаліму, і знайшоў яго на шляху прарок Ахія з
Шыло. А быў ён апрануты ў новы плашч, і толькі яны адны былі ў полі.
30 І зьняў Ахія новы плашч, які быў на ім, і падзёр яго на дванаццаць частак,
31 і сказаў Ерабааму: «Вазьмі сабе дзесяць частак, бо гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Вось, Я
вырываю валадарства з рукі Салямона і даю табе дзесяць каленаў.
32 І толькі адно калена застанецца яму дзеля слугі Майго, Давіда, і дзеля гораду Ерусаліму, які
Я выбраў з усіх каленаў Ізраіля,
33 бо яны пакінулі Мяне і пакланяліся Астарце, багіні Сідонцаў, і Кемошу, богу Мааву, і
Мількому, богу сыноў Амона, і не хадзілі шляхамі Маімі, каб рабіць слушнае ў вачах Маіх,
[выконваць] пастановы Мае і прысуды Мае, як Давід, бацька ягоны.
34 Але Я не забяру з рукі ягонай усяго валадарства, бо Я паставіў яго князем у-ва ўсе дні жыцьця
ягонага дзеля Давіда, слугі Майго, якога Я выбраў і які захоўваў прыказаньні Мае і пастановы
Мае.
35 І Я забяру валадарства з рукі сына ягонага, і дам табе дзесяць каленаў.
36 А сыну ягонаму Я дам адно калена, каб [заставаўся] сьветач Давіда, слугі Майго, перад
абліччам Маім у-ва ўсе дні ў горадзе Ерусаліме, які Я выбраў Сабе, каб было там імя Маё.
37 А цябе Я ўзяў, і ты будзеш валадарыць над усім, чаго зажадае душа твая, і будзеш валадаром
над Ізраілем.
38 І станецца, калі ты будзеш слухаць усё, што Я загадаю табе, і будзеш хадзіць шляхамі Маімі,
і будзеш рабіць слушнае ў вачах Маіх, захоўваючы пастановы Мае і прыказаньні Мае, як рабіў
Давід, слуга Мой, Я буду з табой і пабудую табе дом трывалы, як пабудаваў Давіду, і дам табе
Ізраіль.
39 І Я пакараю нашчадкаў Давіда, але не на ўсе дні”».
40 І спрабаваў Салямон забіць Ерабаама, і ўстаў Ерабаам, і ўцёк у Эгіпет да Шышака, валадара
Эгіпецкага, і быў у Эгіпце да сьмерці Салямона.
41 А іншыя дзеяньні Салямона, і ўсё, што ён рабіў, і мудрасьць ягоная запісаныя ў Кнізе
летапісаў Салямона.
42 І дзён, калі Салямон валадарыў над усім Ізраілем у Ерусаліме [было] сорак гадоў.
43 І супачыў Салямон з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў горадзе Давіда, бацькі свайго. І пачаў
валадарыць замест яго Рэхабаам, сын ягоны.

1 Вал 12

1 І пайшоў Рэхабаам у Сыхэм, бо ў Сыхэм прыйшоў увесь Ізраіль, каб паставіць яго валадаром.
2 І сталася, што пачуў [пра гэта] Ерабаам, сын Навата, а ён яшчэ быў у Эгіпце, куды ўцёк ад аблічча валадара Салямона, і вярнуўся Ерабаам з Эгіпту.
3 І паслалі, і паклікалі яго. І прыйшоў Ерабаам і ўся царква Ізраіля, і прамовілі яны да Рэхабаама, кажучы:
4 «Бацька твой узлажыў на нас ярмо цяжкае, а ты цяпер зьменшы цяжкія работы бацькі твайго і цяжар ярма ягонага, якое ён узлажыў на нас, і мы будзем служыць табе».
5 І ён сказаў ім: «Ідзіце і праз тры дні вярніцеся да мяне». І народ адыйшоў.
6 І валадар Рэхабаам раіўся са старшынямі, якія стаялі перад абліччам Салямона, бацькі ягонага, калі ён яшчэ жыў, кажучы: «Якое слова вы параіце мне адказаць народу гэтаму?»
7 І яны прамовілі да яго, кажучы: «Калі сёньня будзеш слугою народу гэтага і прыслужышся яму, і адкажаш ім, і прамовіш да іх словы добрыя, будуць яны слугамі тваімі ў-ва ўсе дні».
8 Але ён адкінуў раду старшыняў, якую яны яму далі, і раіўся з юнакамі, якія гадаваліся разам з ім і якія стаялі перад абліччам ягоным.
9 І сказаў ён ім: «Што вы параіце мне адказаць народу гэтаму? Бо яны прамовілі да мяне, кажучы: “Зрабі лягчэйшым ярмо, якое ўзлажыў на нас бацька твой”».
10 І прамовілі да яго юнакі, якія разам з ім гадаваліся, кажучы: «Так скажы гэтаму народу, які прамовіў да цябе, кажучы: “Бацька твой зрабіў цяжкім ярмо нашае, а ты зрабі лягчэйшым ярмо нашае”. Так прамоў да іх: “Найменшы палец мой таўшчэйшы за сьцёгны бацькі майго.
11 Бацька мой узлажыў на вас ярмо цяжкае, а я яшчэ дадам да ярма вашага. Бацька мой караў вас пугамі, а я буду караць вас скарпіёнамі”».
12 І на трэці дзень прыйшоў Ерабаам і ўвесь народ да Рэхабаама, як быў ім сказаўшы валадар, кажучы: «Вярніцеся да мяне праз тры дні».
13 І адказаў валадар народу жорстка, бо ён адкінуў параду старшыняў, якую яны яму давалі,
14 а прамовіў да іх паводле рады юнакоў, кажучы: «Бацька мой зрабіў цяжкім ярмо вашае, а я яшчэ дадам да ярма вашага. Бацька мой караў вас пугамі, а я буду караць вас скарпіёнамі».
15 І не паслухаў валадар народу, бо гэта было вызначана ГОСПАДАМ, каб споўнілася слова, якое ГОСПАД прамовіў праз Ахію з Шыло Ерабааму, сыну Навата.
16 І ўбачыў увесь Ізраіль, што валадар ня чуе іх, і адказаў народ валадару слова, кажучы: «Якая частка нашая ў Давідзе або якая спадчына [нашая] ў сыне Есэя? Ізраіль, [ідзі] ў намёты свае! Цяпер, Давід, сам глядзі дом твой!» І пайшоў Ізраіль у намёты свае.
17 І Рэхабаам заваладарыў толькі над тымі сынамі Ізраіля, якія жылі ў гарадах Юды.
18 І паслаў валадар Рэхабаам Аданірама, які быў наглядчыкам за данінаю, і ўкаменавалі яго камянямі ўсе Ізраільцяне, і ён памёр. І валадар Рэхабаам пасьпешліва сеў у калясьніцу, і ўцёк у Ерусалім.
19 І адыйшоў Ізраіль ад дому Давіда аж да сёньняшняга дня.
20 І пачуў увесь Ізраіль, што вярнуўся Ерабаам, і паслалі, і паклікалі яго да грамады, і паставілі яго валадаром над усім Ізраілем. А пры доме Давіда не засталося нікога, апрача калена Юды.
21 І вярнуўся Рэхабаам у Ерусалім, і сабраў увесь дом Юды і калена Бэн’яміна, сто восемдзясят тысячаў выбранцоў, каб пачаць вайну з домам Ізраіля і вярнуць валадарства Рэхабааму, сыну Салямона.
22 І было слова Божае да Шэмаі, чалавека Божага, кажучы:
23 «Скажы Рэхабааму, сыну Салямона, валадару Юды, і ўсяму дому Юды і Бэн’яміна, і рэшце народу, кажучы:
24 “Гэта кажа ГОСПАД. Не ідзіце і не ваюйце супраць братоў вашых, сыноў Ізраіля. Няхай кожны вяртаецца ў дом свой, бо ад Мяне сталася гэта”». І яны паслухаліся слова ГОСПАДА, і вярнуліся, ідучы паводле слова ГОСПАДА.
25 І пабудаваў Ерабаам Сыхэм на гары Эфраіма, і абжыўся там, а [потым] выйшаў адтуль і пабудаваў Пэнуэль.
26 І сказаў Ерабаам у сэрцы сваім: «Цяпер валадарства вернецца да дому Давіда,

27 калі народ гэты будзе хадзіць складаць ахвяры ў Доме ГОСПАДА ў Ерусаліме, і вернецца
сэрца народу гэтага да гаспадара свайго Рэхабаама, валадара Юды. І яны заб'юць мяне, і
вернуцца да Рэхабаама, валадара Юды».
28 І радзіўся валадар, і зрабіў двух залатых быкоў і сказаў [народу]: «Далёка для вас хадзіць у
Ерусалім! Вось бог твой, Ізраілю, які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай».
29 І паставіў аднаго [быка] ў Бэтэлі, а другога паставіў у Дане.
30 І гэта прывяло да грэху, і народ стаў хадзіць перад аблічча аднаго з іх аж у Дан.
31 І паставіў ён сьвятыню на ўзгорку, і паставіў сьвятарамі [звычайных] людзей, якія не былі
сынамі Левія.
32 І ўстанавіў Ерабаам сьвята ў восьмым месяцы, у пятнаццаты дзень месяца, падобнае да таго
сьвята, якое ў Юдзе, і сам узыйшоў да ахвярніка. І зрабіў ён так у Бэтэлі, складаючы ахвяру
крывавую быкам, якіх сам зрабіў. І паставіў ён у Бэтэлі святароў для ўзгоркаў, якія пабудаваў.
33 І ўзыйшоў ён да ахвярніка, які зрабіў у Бэтэлі, у пятнаццаты дзень восьмага месяца, які
вызначыў паводле [намеру] сэрца свайго, і ўстанавіў сьвята для сыноў Ізраіля. І ўзыйшоў ён
да ахвярніка, каб кадзіць.

1 Вал 13

1 І вось, прыйшоў чалавек Божы з Юды ў Бэтэль паводле слова ГОСПАДА, а Ерабаам стаяў пры
ахвярніку, каб кадзіць.
2 І закрычаў [чалавек Божы] на ахвярнік паводле слова ГОСПАДА, і сказаў: «Ахвярнік, ахвярнік,
гэта кажа ГОСПАД: "Вось, у доме Давіда народзіцца сын на імя Ёсія, і ён на табе складзе ў ахвяру
сьвятароў узгоркаў, якія кадзяць пры табе, і спаліць на табе косткі чалавечыя».
3 У той дзень ён даў знак, кажучы: «Вось, будзе знак, што гэта сказаў ГОСПАД. Вось, ахвярнік
распадзецца, і попел, які на ім, рассыпецца».
4 І сталася, калі валадар пачуў слова чалавека Божага, якое ён выказаў супраць ахвярніка ў
Бэтэлі, выцягнуў Ерабаам руку сваю з-над ахвярніка, кажучы: «Схапіце яго!» Але здрантвела
рука ягоная, якую ён выцягнуў супраць яго, і ён ня мог яе вярнуць да сябе.
5 А ахвярнік распаўся, і попел з ахвярніка рассыпаўся паводле знаку, які даў чалавек Божы
паводле слова ГОСПАДА.
6 І адказаў валадар, і сказаў чалавеку Божаму: «Перапрасі аблічча ГОСПАДА, Бога твайго, і
памаліся за мяне, і вернецца рука мая да мяне». І перапрасіў чалавек Божы аблічча ГОСПАДА,
і вярнулася рука валадара да яго, і рухалася як раней.
7 І прамовіў валадар да чалавека Божага: «Ідзі са мной у дом і паеш, і я дам табе падарунак».
8 І сказаў чалавек Божы валадару: «Калі б ты і палову дома свайго даваў мне, не пайду з табой
і ня буду есьці хлеба, і ня буду піць вады ў гэтым месцы.
9 Бо гэтак загадаў мне слова ГОСПАД, кажучы: "Ня будзеш есьці хлеба і ня будзеш піць вады, і
ня вернешся тым шляхам, па якім прыйшоў"».
10 І пайшоў ён іншым шляхам, і не вярнуўся тым шляхам, па якім ён прыйшоў у Бэтэль.
11 А ў Бэтэлі жыў адзін стары прарок. І прыйшлі сыны ягоныя, і расказалі яму ўсе справы,
якія зрабіў у той дзень чалавек Божы ў Бэтэлі, а таксама словы, якія ён прамовіў да валадару,
і расказалі гэта бацьку свайму.
12 І прамовіў да іх бацька іхні: «Якім шляхам ён пайшоў?» І сыны ягоныя паказалі яму шлях,
па якім пайшоў чалавек Божы, які прыйшоў з Юды.
13 І сказаў ён сынам сваім: «Асядлайце мне асла». І яны асядлалі яму асла, і ён сеў на яго,
14 і паехаў за чалавекам Божым, і знайшоў яго, калі той сядзеў пад дубам, і сказаў яму: «Ці ня
ты чалавек Божы, які прыйшоў з Юды?» Ён сказаў: «Я».
15 І ён сказаў яму: «Ідзі да мяне ў дом і паеш хлеба».
16 Той сказаў: «Не магу вярнуцца з табою і пайсьці да цябе, і ня буду есьці хлеба і ня буду піць
вады ў гэтым месцы,
17 бо прамовіў да мяне слова ГОСПАД: "Ня будзеш есьці хлеба і ня будзеш піць там вады, і ня
вернешся шляхам, па якім прыйшоў"».

18 І сказаў ён яму: «І я прарок, падобны табе. І анёл прамовіў да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
“Вярні яго ў дом твой, і няхай ён есьць хлеб і п’е ваду”». І падмануў яго.
19 І ён вярнуўся з ім, і еў хлеб у доме ягоным, і піў ваду.
20 А калі сядзелі яны яшчэ пры стале, было слова ГОСПАДА да прарока, які вярнуў яго [з дарогі].
21 І закрычаў ён да чалавека Божага, які прыйшоў з Юды, кажучы: «Гэта кажа ГОСПАД. За тое,
што ты ўзбунтаваўся супраць [слова] з вуснаў ГОСПАДА і не захаваў даручэньня, якое загадаў
табе ГОСПАД, Бог твой,
22 але вярнуўся, і еў хлеб, і піў ваду на месцы, пра якое Я прамовіў да цябе: "Ня еш [там] хлеба
і ня пі вады", парэшткі твае ня ўвойдуць у магілу бацькоў тваіх”».
23 І калі той зьеў хлеб і напіўся, ён асядлаў асла для таго прарока, якога вярнуў.
24 І той пайшоў. І знайшоў яго леў на шляху, і забіў яго, і парэшткі ягоныя ляжалі, кінутыя пры
дарозе, і асёл стаяў каля іх, і леў стаяў каля парэшткаў.
25 І вось, людзі, што там праходзілі, убачылі парэшткі, кінутыя пры дарозе, і льва, які стаяў
каля парэшткаў. І яны пайшлі, і паведамілі ў горадзе, у якім жыў стары прарок.
26 І пачуў той прарок, які яго завярнуў з дарогі, і сказаў: «Гэта чалавек Божы, які збунтаваўся
супраць [слова] з вуснаў ГОСПАДА, і аддаў яго ГОСПАД льву, і ён разьдзёр яго, і забіў яго
паводле слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў да яго».
27 І прамовіў ён да сыноў сваіх, кажучы: «Асядлайце мне асла!» І яны асядлалі.
28 І ён паехаў, і знайшоў парэшткі ягоныя, кінутыя пры дарозе, і асла, і льва, якія стаялі каля
парэшткаў. І леў ня еў парэшткі і не разьдзёр асла.
29 І прарок падняў парэшткі чалавека Божага, і ўсклаў іх на асла і прывёз яго назад у горад, і
прыйшоў стары прарок, каб плакаць над ім і пахаваць яго.
30 І паклаў ён парэшткі ягоныя ў магіле сваёй, і плакаў над ім: «О, браце мой!»
31 І калі пахаваў яго, сказаў сынам сваім, кажучы: «Калі я памру, пахавайце мяне ў магіле, у
якой пахаваны чалавек Божы. Каля костак ягоных палажыце косткі мае.
32 Бо спаўняюыся, споўніцца слова, якое ён прамовіў паводле слова ГОСПАДА адносна
ахвярніка, які ў Бэтэлі, і адносна ўсіх сьвятыняў на ўзгорках, якія ў гарадах Самарыі».
33 Пасьля ўсяго гэтага Ерабаам не зьвярнуў з ліхога шляху свайго, і паставіў са [звычайных]
людзей сьвятароў для ўзгоркаў. Хто толькі хацеў, таго пасьвячала рука ягоная, і той ставаўся
сьвятаром для ўзгоркаў.
34 І сталася гэта грахом для дому Ерабаама і прычынай загубы і вынішчэньня з аблічча зямлі.

1 Вал 14

1 У той час захварэў Абія, сын Ерабаама.
2 І сказаў Ерабаам жонцы сваёй: «Устань і зьмяні выгляд свой, каб не пазналі, што ты — жонка
Ерабаама, і ідзі ў Шыло. Вось, там Ахія прарок, які сказаў мне, што я буду валадаром над
народам гэтым.
3 І вазьмі ў руку тваю дзесяць хлябоў, печыва і збан мёду, і ідзі да яго. Ён паведаміць табе, што
станецца з хлопцам».
4 І зрабіла так жонка Ерабаама. І ўстала яна, і пайшла ў Шыло, і прыйшла ў дом Ахіі. А Ахія ня
мог бачыць, бо сьцямнелі вочы ягоныя дзеля старасьці.
5 І сказаў ГОСПАД Ахіі: «Вось, прыходзіць жонка Ерабаама, каб шукаць слова адносна сына
свайго, які хварэе. Гэта і гэта прамовіш да яе. Калі яна прыйдзе, яна будзе пераапранутая».
6 І сталася, што Ахія пачуў шоргат ног ейных, калі яна ўваходзіла, і сказаў: «Уваходзь, жонка
Ерабаама. Чаму ты пераапранулася? Я — суворы пасланьнік для цябе.
7 Ідзі і скажы Ерабааму: “Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. За тое, што Я ўзвысіў цябе спасярод
народу, і зрабіў цябе правадыром над народам Маім, Ізраілем,
8 і адарваў валадарства ад дому Давіда, і даў яго табе, але ты ня быў такі, як слуга Мой Давід,
які захоўваў прыказаньні Мае і хадзіў за Мною ўсім сэрцам сваім, робячы толькі слушнае ў
вачах Маіх,

9 і рабіў ты горш за ўсіх, якія былі перад табой, і пайшоў, і зрабіў сабе багоў чужых і [ідалаў]
літых, каб гнявіць Мяне, а Мяне адкінуў за плечы свае,
10 дзеля гэтага, вось, Я навяду на дом Ерабаама ліха, і выб'ю з [роду] Ерабаама ўсіх, хто
мочыцца на сьцяну, ад нявольніка да вольнага ў Ізраілі, і вымяту рэшткі дому Ерабаама, як
вымятаецца сьмецьце, аж да канца.
11 Хто ў Ерабаама памрэ ў горадзе, таго зьядуць сабакі, а хто памрэ ў полі, таго будуць жэрці
птушкі паднебныя, бо гэта прамовіў ГОСПАД".
12 А ты ўстань і вяртайся ў дом твой, і калі ногі твае ўвойдуць у горад, памрэ дзіцятка,
13 і будзе плакаць над ім увесь Ізраіль, і пахаваюць яго, бо толькі ён з [роду] Ерабаама ўвойдзе
ў магілу, бо ў доме Ерабаама толькі ў ім знайшлося нешта добрае перад ГОСПАДАМ, Богам
Ізраіля.
14 І паставіць ГОСПАД Сабе валадара над Ізраілем, які выгубіць дом Ерабаама ў той дзень. І ўжо
цяпер [паставіў].
15 І ўдарыць ГОСПАД Ізраіля, што ён захістаецца як трысьнёг на вадзе, і выганіць Ізраіля з гэтай
добрай зямлі, якую Ён даў бацькам іхнім, і расьцярушыць іх за ракою за тое, што яны зрабілі
Астартаў сваіх, каб гнявіць ГОСПАДА.
16 І пакіне ГОСПАД Ізраіля дзеля грахоў Ерабаама, які сам грашыў і ўвёў у грэх Ізраіля».
17 І ўстала жонка Ерабаама, і пайшла, і прыйшла ў Тырцу. І калі яна пераступала парог дому,
памёр хлопец.
18 І пахавалі яго, і галасіў над ім увесь Ізраіль паводле слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў праз
слугу Свайго Ахію прарока.
19 А іншыя дзеяньні Ерабаама, як ён ваяваў і як валадарыў, запісаныя ў Кнізе летапісаў
валадароў Ізраіля.
20 А дзён, калі валадарыў Ерабаам, [было] дваццаць два гады. І супачыў ён з бацькамі сваімі, і
заваладарыў Надаў, сын ягоны, пасьля яго.
21 А Рэхабаам, сын Салямона, быў валадаром у Юдзе. Сорак адзін год было Рэхабааму, калі ён
пачаў валадарыць, і сямнаццаць гадоў ён валадарыў у Ерусаліме, у горадзе, які выбраў ГОСПАД
з усіх каленаў Ізраіля, каб там было імя Ягонае. Імя маці ягонай — Наама Аманянка.
22 І рабіў Юда ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і гнявілі яны Яго больш, чым бацькі іхнія, у грахах сваіх,
якімі грашылі.
23 І будавалі яны сабе ўзгоркі, слупы і Астартаў на кожным узгорку высокім і пад кожным
дрэвам зялёным.
24 І была таксама распуста ў зямлі, і чынілі яны ўсякую брыдоту народаў, якіх выгнаў ГОСПАД
перад абліччам сыноў Ізраіля.
25 І сталася ў пятым годзе валадара Рэхабаама, пайшоў супраць Ерусаліму Шышак, валадар
Эгіпту.
26 Ён зрабаваў скарбы Дому ГОСПАДА і скарбы дому валадара, і ўсё забраў, і забраў усе шчыты
залатыя, якія зрабіў Салямон.
27 Замест іх валадар Рэхабаам зрабіў шчыты мядзяныя і перадаў іх у рукі начальнікаў варты,
якая пільнавала ўваход у дом валадара.
28 І сталася, што кожны раз, калі валадар уваходзіў у Дом ГОСПАДА, уносіла іх варта, а [потым]
адносіла іх у збраёўню варты.
29 Іншыя дзеяньні Рэхабаама і ўсё, што ён рабіў, заспісана ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
30 А вайна паміж Рэхабаамам і Ерабаамам была ўсе дні.
31 І супачыў Рэхабаам з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда. А
імя маці ягонай — Наама Аманянка. А пасьля яго валадаром стаў Абіям, сын ягоны.

1 Вал 15

1 У васямнаццатым годзе валадара Ерабаама, сына Навата, у Юдзе стаў валадаром Абіям.
2 Тры гады ён валадарыў у Ерусаліме. А імя маці ягонай — Мааха, дачка Абсалома.

3 І хадзіў ён у-ва ўсіх грахах бацькі свайго, якія ён рабіў перад ім, і не было сэрца ягонае
шчырым перад ГОСПАДАМ, Богам ягоным, як сэрца Давіда, бацькі ягонага.
4 Аднак дзеля Давіда даў яму ГОСПАД, Бог ягоны, сьветач у Ерусаліме, каб паставіць сына
ягонага пасьля яго і ўмацаваць Ерусалім,
5 бо Давід рабіў тое, што слушнае ў вачах ГОСПАДА і не ўхіляўся ад таго, што Ён яму загадваў
праз усе дні жыцьця свайго, акрамя справы Урыі Хета.
6 І вайна паміж Рэхабаамам і Ерабаамам была ўсе дні жыцьця ягонага.
7 Іншыя дзеяньні Абіяма і ўсё, што ён рабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды. І была
вайна паміж Абіямам і Ерабаамам.
8 І супачыў Абіям з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў горадзе Давіда. І заваладарыў Аса, сын
ягоны, пасьля яго.
9 У дваццатым годзе Ерабаама, валадара Ізраіля, заваладарыў Аса, валадар Юды.
10 Сорак адзін год ён быў валадаром у Ерусаліме. А імя маці ягонай — Мааха, дачка Абсалома.
11 І рабіў Аса слушнае ў вачах ГОСПАДА, як Давід, бацька ягоны.
12 І ён выгнаў распусьнікаў з зямлі, і павынішчаў усіх ідалаў, якіх нарабілі бацькі ягоныя.
13 І нават маці сваю Мааху ён пазбавіў годнасьці валадаркі за тое, што яна зрабіла ідала
Астарты. І Аса пасек ідала ейнага, і спаліў каля ручая Кедрон.
14 Але ўзгоркі не былі зьнішчаныя. Аднак сэрца Асы было шчырым перад ГОСПАДАМ у-ва ўсе
дні [ягоныя].
15 І прынёс ён у Дом ГОСПАДА рэчы, пасьвячоныя бацькам ягоным і ім самім: срэбра, золата і
посуд.
16 І была вайна паміж Асам і Баашам, валадаром Ізраіля, праз усе дні іхнія.
17 І пайшоў валадар Ізраіля Бааша на Юду, і пабудаваў Раму, каб [ніхто] ня мог увайсьці і
выйсьці да Асы, валадара Юды.
18 І ўзяў Аса ўсё срэбра і золата, якое засталося ў скарбніцы Дому ГОСПАДА і ў скарбніцы дому
валадара, і даў яго слугам сваім, і паслаў іх да Бэн-Гадада, сына Табрымона, сына Хэзіёна,
валадара Сірыі, які жыў у Дамаску, кажучы:
19 «Запавет [ёсьць] паміж мною і табой, паміж бацькам маім і бацькам тваім. Вось, я пасылаю
табе дары: срэбра і золата. Ідзі, парві запавет твой з Баашам, валадаром Ізраіля, і ён адыйдзе
ад мяне».
20 І паслухаў Бэн-Гадад валадара Асу, і паслаў начальнікаў войска свайго ў гарады Ізраіля. І
захапілі яны Іён, Дан і Абэль-Бэт-Мааху, і ўвесь Кінэрэт, і ўсю зямлю Нэфталі.
21 І пачуў [пра гэта] Бааша, і кінуў будаваць Раму, і вярнуўся ў Тырцу.
22 І валадар Аса паклікаў усяго Юду без выключэньня, і забралі яны з Рамы камяні і дрэва, якімі
[карыстаўся] Бааша для будаўніцтва, і разбудаваў імі валадар Аса Гіву Бэн'ямінаву і Міцпу.
23 А іншыя дзеяньні Асы, мужнасьць ягоная і ўсё, што ён зрабіў, і гарады, якія пабудаваў,
запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды. Калі ж ён састарэўся, хварэў на ногі.
24 І супачыў Аса з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда, бацькі
свайго. І заваладарыў Язафат, сын ягоны, пасьля яго.
25 У другім годзе Асы, валадара Юды, пачаў валадарыць над Ізраілем Надаў, сын Ерабаама, і
валадарыў ён над Ізраілем два [гады].
26 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў шляхамі бацькі свайго і ў грэху ягоным, якім той
увёў у грэх Ізраіля.
27 І зрабіў супраць яго змову Бааша, сын Ахіі, з дому Ісахара, і напаў на яго ў Гіббэтоне, які быў
[горадам] Філістынцаў, калі Надаў і ўвесь Ізраіль аблягалі Гіббэтон.
28 І Бааша забіў яго ў трэцім годзе Асы, валадара Юды, і сам стаў валадаром замест яго.
29 І калі ён пачаў валадарыць, выбіў ён увесь дом Ерабаама, і не пакінуў ніводнай душы з [роду]
Ерабаама, пакуль ня вынішчыў яго паводле слова ГОСПАДА, як прамовіў Ён праз слугу свайго
Ахію з Шыло,
30 дзеля грахоў Ерабаама, які сам грашыў і ўвёў Ізраіля ў грэх, чым гнявіў ГОСПАДА, Бога
Ізраіля.

31 А іншыя дзеяньні Надава і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
32 І была вайна паміж Асам і Баашам, валадаром Ізраіля, усе дні іхнія.
33 У трэцім годзе Асы, валадара Юды, Бааша, сын Ахіі, стаў валадаром над усім Ізраілем у Тырцы на дваццаць чатыры гады.
34 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў шляхам Ерабаама і ў грахах ягоных, якімі той увёў у грэх Ізраіля.

1 Вал 16

1 І было слова ГОСПАДА да Егу, сына Хананіі, супраць Баашы, кажучы:
2 «За тое, што Я цябе падняў з парахна і паставіў правадыром над народам Маім, Ізраілем, а ты хадзіў шляхам Ерабаама і ўводзіў у грэх народ Мой, Ізраіля, каб Мяне гнявіць грахамі іхнімі,
3 вось, Я вымету рэшткі Баашы і рэшткі дому ягонага і зраблю з домам ягоным тое, што зрабіў з домам Ерабаама, сына Навата.
4 Хто ў Баашы памрэ ў горадзе, таго зьядуць сабакі, а хто памрэ ў полі, таго будуць жэрці птушкі паднебныя».
5 Іншыя дзеяньні Баашы, і ўсё, што ён рабіў, і мужнасьць ягоная запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
6 І супачыў Бааша з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў Тырцы. А пасьля яго стаў валадаром Эла, сын ягоны.
7 І зноў было слова ГОСПАДА праз прарока Егу, сына Хананіі, супраць Баашы і дому ягонага дзеля ўсякага зла, якое ён чыніў у вачах ГОСПАДА, гневаючы Яго ўчынкамі рук сваіх, калі рабіў так, як дом Ерабаама, які ён выгубіў.
8 У дваццаць шостым годзе Асы, валадара Юды, Эла, сын Баашы, стаў валадаром над Ізраілем у Тырцы на два [гады].
9 І слуга ягоны Зімры, начальнік над паловаю калясьніцаў, змовіўся супраць яго. І калі Эла быў напіўся ў доме Арцы, загадчыка дому ў Тырцы,
10 Зімры напаў на яго, і ўдарыў яго, і забіў яго ў дваццаць сёмым годзе Асы, валадара Юды, і стаў валадаром замест яго.
11 І калі ён стаў валадаром, і сеў на пасадзе ягоным, ён выбіў увесь дом Баашы, і не пакінуў з яго анікога, хто мочыцца на сьцяну, ані сваякоў, ані сяброў ягоных.
12 І зьнішчыў Зімры ўвесь дом Баашы паводле слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў пра Баашу праз Егу прарока
13 з прычыны ўсіх грахоў Баашы і грахоў Элы, сына ягонага, якімі яны самі грашылі і якімі ўводзілі ў грэх Ізраіля, гневаючы ГОСПАДА, Бога Ізраіля, марнасьцямі сваімі.
14 А іншыя дзеяньні Элы, і ўсё, што ён рабіў, запісана ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
15 У дваццаць сёмым годзе Асы, валадара Юды, заваладарыў Зімры на сем дзён у Тырцы, а народ [Ізраіля] разлажыўся табарам каля Гіббэтону, гораду Філістынцаў.
16 І пачуў народ, які разлажыўся табарам, што кажуць: «Зімры ўчыніў змову і забіў валадара». І ўвесь Ізраіль, які быў у табары, паставіў у той дзень валадаром Омры, начальніка войска Ізраіля.
17 І выйшаў Омры, і ўвесь Ізраіль з ім, з-пад Гіббэтону і абляглі Тырцу.
18 І сталася, калі Зімры ўбачыў, што горад здабыты, ён увайшоў у вежу дому валадара, і падпаліў дом валадара агнём, і памёр
19 дзеля грахоў сваіх, якімі грашыў, чынячы ліхоту ў вачах ГОСПАДА і ходзячы шляхам Ерабаама і ў грахах ягоных, якія той рабіў і ўводзіў у грэх Ізраіля.
20 Іншыя дзеяньні Зімры, і змова ягоная, якую ён учыніў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
21 Тады народ Ізраіля падзяліўся на дзьве часткі: палова народу стаяла за Тыўні, сына Гіната, каб яго паставіць валадаром, а палова — за Омры.
22 І быў мацнейшы народ, які [стаяў] за Омры, чым той, што [стаяў] за Тыўні, сына Гіната. І Тыўні памёр, а валадарыў Омры.

23 У трыццаць першым годзе Асы, валадара Юды, Омры стаў валадаром над Ізраілем на
дванаццаць гадоў. У Тырцы ён валадарыў шэсьць гадоў.
24 І ён купіў за два таленты срэбра ў Шэмэра гару Шамэрон, і забудаваў гару, і гораду, які
пабудаваў, даў імя Самарыяй ад імя Шэмэра, гаспадара гары.
25 І рабіў Омры ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і чыніў зло горш за ўсіх, якія былі перад ім.
26 І хадзіў ён усімі шляхамі Ерабаама, сына Навата, і ў грахах ягоных, якімі той увёў у грэх
Ізраіля, каб гнявіць ГОСПАДА, Бога Ізраіля, марнасьцямі сваімі.
27 А іншыя дзеяньні Омры, якія ён зрабіў, і мужнасьць ягоная запісаныя ў Кнізе летапісаў
валадароў Ізраіля.
28 І супачыў Омры з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў Самарыі. А пасьля яго заваладарыў Ахаў,
сын ягоны.
29 Ахаў, сын Омры, стаў валадаром Ізраіля ў трыццаць восьмым годзе Асы, валадара Юды, і
валадарыў Ахаў, сын Омры, над Ізраілем у Самарыі дваццаць два гады.
30 І Ахаў, сын Омры, рабіў ліхоту ў вачах ГОСПАДА, горш за ўсіх, што былі перад ім.
31 Мала яму было хадзіць у грахах Ерабаама, сына Навата, і ён узяў за жонку Езабэль, дачку
Этбаала, валадара Сідонцаў, і хадзіў, і служыў Баалу, і пакланяўся яму.
32 І паставіў ён ахвярнік Баалу ў доме Баала, які пабудаваў у Самарыі.
33 І зрабіў Ахаў Астарту, і сваімі ўчынкамі Ахаў гнявіў ГОСПАДА, Бога Ізраіля, болей, чым усе
валадары Ізраіля, якія былі перад ім.
34 У дні ягоныя Хіэль з Бэтэлю адбудаваў Ерыхон. Падмуркі ягоныя ён паклаў на першародным
сваім, Абіраме, а на наймалодшым сваім, Сэгібе, паставіў брамы ягоныя, паводле слова
ГОСПАДА, сказанага праз Егошуа, сына Нуна.

1 Вал 17

1 І сказаў Ільля з Тэшбы з жыхароў Гілеаду Ахаву: «Як жывы ГОСПАД, Бог Ізраіля, перад Якім
я стаю. У гэтыя гады ня будзе ані расы, ані дажджу, пакуль ня будзе слова з вуснаў маіх!»
2 І было слова ГОСПАДА да яго, кажучы:
3 «Адыйдзі адсюль і ідзі на ўсход, і схавайся пры ручаі Керыт, які на ўсход ад Ярдану.
4 Ваду будзеш піць з ручая, і Я загадаў крумкачам, каб яны кармілі цябе там».
5 І ён пайшоў, і зрабіў паводле слова ГОСПАДА. І пайшоў, і сеў каля ручая Керыт, які на ўсход
ад Ярдану.
6 І крумкачы прыносілі яму хлеб і мяса раніцай, і хлеб і мяса ўвечары, а [ваду] ён піў з ручая.
7 І сталася, праз нейкі час ручай высах, бо не было дажджу ў зямлі [Ізраіля].
8 І было слова ГОСПАДА да яго, кажучы:
9 «Устань і ідзі ў Сарэпту Сідонскую, і жыві там. Вось, Я загадаў там адной удаве, каб карміла
цябе».
10 І ён устаў, і пайшоў у Сарэпту. І прыйшоў ён да брамы гораду, і вось, там жанчына ўдава
зьбірае дровы. І ён паклікаў яе, і сказаў: «Набяры мне, калі ласка, крыху вады збанам і дай
мне піць».
11 І яна пайшла, каб набраць [вады], і ён паклікаў да яе, і сказаў: «Прынясі мне яшчэ, калі
ласка, лустачку хлеба рукою тваёй».
12 А яна сказала: «Як жывы ГОСПАД, Бог твой, я ня маю сьпечанага [хлеба], толькі жменю мукі
ў збане і крыху алею ў гляку. І вось, я назьбіраю крыху дроваў, і пайду, і прыгатую сабе і сыну
майму [пасілак], і мы зьямо, і памром».
13 І сказаў ёй Ільля: «Ня бойся, але ідзі і зрабі, як ты казала, толькі перш зрабі для мяне аладку
з гэтай [мукі] і прынясі мне. А сабе і сыну твайму зробіш потым.
14 Бо гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Мука ў збане ня скончыцца і алею ў гляку ня зьменшыцца
аж да дня, у які ГОСПАД дасьць дождж на аблічча зямлі”».
15 І яна пайшла, і зрабіла паводле слова Ільлі, і яна ела, і ён, і дом ейны [шмат] дзён.
16 І мука ў збане ня сканчвалася і алею ў гляку ня меншала паводле слова ГОСПАДА, якое Ён
прамовіў праз Ільлю.

17 І сталася пасьля падзеяў гэтых, што захварэў сын той жанчыны, гаспадыні дому. І хвароба
ягоная была вельмі цяжкая, і ён перастаў дыхаць.
18 І сказала яна Ільлі: «Што мне і табе, чалавек Божы? Хіба прыйшоў ты да мяне, каб прыгадаць
мне беззаконьні мае і забіць сына майго?»
19 А ён сказаў ёй: «Дай мне сына твайго». І ён узяў яго ад грудзей ейных, і занёс у верхні пакой,
дзе сам жыў, і палажыў яго на ложак свой.
20 І клікаў ён да ГОСПАДА, і казаў: «ГОСПАДЗЕ, Божа мой, няўжо ўдаве, у якой я жыву, Ты робіш
ліха, што памірае сын ейны?»
21 І тры разы ён лёг на дзіця, і клікаў да ГОСПАДА, і казаў: «ГОСПАДЗЕ, Божа мой, няхай
вернецца душа дзіцяці гэтага ў яго».
22 І выслухаў ГОСПАД голас Ільлі, і вярнулася душа дзіцяці ў яго, і [хлопчык] аджыў.
23 І ўзяў Ільля хлопчыка, і занёс яго з верхняга пакою ў дом, і аддаў яго маці ягонай, і сказаў
Ільля: «Глядзі, жывы сын твой».
24 І жанчына сказала Ільлі: «Цяпер я ведаю, што ты — чалавек Божы, і слова ГОСПАДА ў вуснах
тваіх — праўда».

1 Вал 18

1 І сталася праз шмат дзён, у трэці год, было слова ГОСПАДА да Ільлі, кажучы: «Ідзі і зьявіся
Ахаву, і Я дам дождж на аблічча зямлі».
2 І пайшоў Ільля, каб зьявіцца Ахаву. А ў Самарыі [быў] моцны голад.
3 І паклікаў Ахаў Абадыю, які [быў] над домам [ягоным], а Абадыя вельмі баяўся ГОСПАДА.
4 І калі Езабэль забівала прарокаў ГОСПАДА, Абадыя ўзяў сто прарокаў і схаваў іх па пяцьдзясят
у адной і другой пячоры, і карміў іх хлебам і вадой.
5 І сказаў Ахаў Абадыі: «Прайдзі па зямлі па ўсіх крыніцах вады і па ўсіх ручаях, можа,
знойдзеш дзе траву, каб зьберагчы [жывымі] коней і мулаў, і не замарыць [голадам] жывёлы».
6 І падзялілі паміж сабой зямлю, каб абыйсьці яе. Ахаў пайшоў адной дарогай, а Абадыя —
другой дарогай асобна.
7 І сталася, калі Абадыя быў у дарозе, вось, Ільля [ідзе] насустрач яму. І ён пазнаў яго, і ўпаў
на аблічча сваё, і сказаў: «Ці гэта ты, гаспадару мой, Ільля?»
8 І ён сказаў яму: «Я. Ідзі і скажы гаспадару твайму: “Вось, Ільля [тут]”».
9 І сказаў [Абадыя]: «Чым я саграшыў, што ты аддаеш слугу твайго ў рукі Ахава, каб ён забіў
мяне?
10 Як жывы ГОСПАД, Бог твой! Няма народу або валадарства, да якога б не паслаў гаспадар мой,
каб цябе адшукаць. А калі адказалі ўсе: “Няма [яго тут]”, ён загадаў прысягнуць [кожнаму]
валадарству і народу, што цябе не знайшлі.
11 І цяпер ты кажаш мне: “Ідзі і скажы гаспадару твайму: "Вось, Ільля [тут]"”.
12 І станецца, калі я адыйдуся ад цябе, возьме цябе Дух ГОСПАДА і занясе ў [месца], якога я
ня ведаю. І я пайду, і паведамлю Ахаву, і ён ня знойдзе цябе, і ён заб’е мяне. А слуга ж твой
баіцца ГОСПАДА ад маладосьці сваёй.
13 Ці не было паедамлена гаспадару майму, што я зрабіў, калі Езабэль забівала прарокаў
ГОСПАДА? Я тады схаваў сто чалавек спаміж прарокаў ГОСПАДА па пяцьдзясят у кожнай
пячоры і карміў іх хлебам і вадой.
14 А цяпер ты мне кажаш: “Ідзі і скажы гаспадару твайму: "Вось, Ільля [тут]"”. Ён жа заб’е
мяне».
15 І сказаў Ільля: «Як жывы ГОСПАД Магуцьцяў, перад абліччам Якога я стаю, яшчэ сёньня я
зьяўлюся яму».
16 І Абадыя пайшоў на спатканьне з Ахавам, і паведаміў яму. І пайшоў Ахаў на сустрэчу з
Ільлёю.
17 І стался, калі Ахаў убачыў Ільлю, сказаў Ахаў яму: «Ці ты той, хто трывожыць Ізраіля?»
18 [Ільля] сказаў: «Ня я трывожу Ізраіля, але ты і дом бацькі твайго, бо ты адкінуў прыказаньні
ГОСПАДА і пайшоў за Баалам.

19 І цяпер пашлі і зьбяры да мяне на гару Кармэль увесь Ізраіль, і чатырыста пяцьдзясят
прарокаў Баала, і чатырыста прарокаў Астарты, якія ядуць са стала Езабэлі».
20 І паслаў Ахаў па ўсіх сыноў Ізраіля, і сабраў прарокаў на гару Кармэль.
21 І наблізіўся Ільля да ўсяго народу, і сказаў: «Дакуль вы будзеце кульгаць на абедзьве нагі?
Калі ГОСПАД ёсьць Бог, ідзіце за Ім, а калі Баал — [бог], ідзіце за ім». Але народ ані слова не
адказаў яму.
22 І сказаў Ільля народу: «Я адзін застаўся з прарокаў ГОСПАДА, а прарокаў Баала — чатырыста
пяцьдзясят.
23 Няхай дадуць нам двух бычкоў, і няхай яны выбяруць сабе аднаго бычка, пасякуць яго і
паложаць на дровы, але няхай не падкладаюць агонь. І я падрыхтую другога бычка і палажу
яго на дровы, але не падкладу агонь.
24 І няхай яны будуць клікаць імя багоў сваіх, а я буду клікаць імя ГОСПАДА. І Бог, Які адкажа
[і спашле] агонь, Той ёсьць Бог!» І ўвесь народ адказаў, і сказаў: «Добрае гэта слова».
25 І сказаў Ільля прарокам Баала: «Выберыце сабе аднаго бычка, і падрыхтуйце [яго] першыя,
бо вас шмат, і клічце імя багоў вашых, але не падкладайце агонь».
26 І ўзялі яны бычка, якога ён даў ім, і падрыхтавалі, і клікалі імя Баала ад раніцы аж да
паўдня, кажучы: «Баал, адкажы нам!» Але не было ані голасу, ані адказу. І яны скакалі кругом
ахвярніка, які зрабілі.
27 І апоўдні Ільля пачаў сьмяяцца з іх, і казаў: «Клічце моцным голасам, бо гэта ж бог. Можа,
ён нечым заняты, або недзе выйшаў, або ў дарозе, або сьпіць, і яго трэба пабудзіць».
28 І крычалі яны моцным голасам, і калечылі сябе паводле звычаю свайго нажамі і дзідамі, аж
лілася з іх кроў.
29 І прайшоў поўдзень, а яны ўсё прарочылі аж да часу складаньня ахвяраў хлебных, але не
было ані голасу, ані адказу, ані ўвагі [да малітвы іхняй].
30 І сказаў Ільля ўсяму народу: «Падыйдзіце да мяне». І калі народ падыйшоў да яго, ён аднавіў
ахвярнік ГОСПАДА, які быў развалены.
31 І ўзяў Ільля дванаццаць камянёў паводле лічбы каленаў сыноў Якуба, якому было слова
ГОСПАД, кажучы: «Ізраіль будзе імя тваё».
32 І з тых камянёў ён пабудаваў ахвярнік для імя ГОСПАДА, і выкапаў роў кругом ахвярніка,
які зьмяшчаў два саты зерня.
33 І пасек ён дровы, і падрыхтаваў бычка, і палажыў на дровы,
34 і сказаў: «Набярыце чатыры вядры вады і выліце ў роў і на дровы!» І сказаў: «Зрабіце гэта
самае другі раз». І зрабілі другі раз, і ён сказаў: «І трэці раз зрабіце гэта самае». І зрабілі трэці
раз.
35 І пацякла вада кругом ахвярніка, і нават роў быў запоўнены вадою.
36 І сталася, калі быў час складаць ахвяру хлебную, падыйшоў Ільля прарок і сказаў:
«ГОСПАДЗЕ, Божа Абрагама, Ісаака і Ізраіля! Сёньня даведаюцца яны, што Ты — Бог у Ізраілі, а
я — слуга Твой, і што паводле слова Твайго я зрабіў усё гэта.
37 Адкажы мне, ГОСПАДЗЕ, адкажы мне, і няхай даведаецца народ гэты, што Ты, ГОСПАДЗЕ, —
Бог, і Ты навярні зноў сэрца іхняе!»
38 І зыйшоў агонь ГОСПАДА, і спаліў ахвяру, і дровы, і камяні, і попел, і ваду, якая была ў рове,
высушыў.
39 І ўбачыў [гэта] ўвесь народ, і ўпаў на аблічча сваё, і сказаў: «ГОСПАД — гэта Бог! ГОСПАД —
гэта Бог!»
40 І сказаў ім Ільля: «Схапіце прарокаў Баала, і няхай ніводзін з іх не ўцячэ!» І схапілі іх, і завёў
іх Ільля да ручая Кішон, і там пазабіваў іх.
41 І сказаў Ільля Ахаву: «Ідзі, еш і пі, бо [я чую] шум вялікага дажджу!»
42 І пайшоў Ахаў есьці і піць, а Ільля ўзыйшоў на вяршыню Кармэля, і нахіліўся да зямлі, і
схаваў аблічча сваё між каленяў сваіх.
43 І сказаў ён слузе свайму: «Выйдзі і глянь у бок мора». І той выйшаў, і глянуў, і сказаў: «Няма
нічога». [Ільля] сказаў яму: «Вяртайся сем разоў!»

44 І ў сёмы раз ён сказаў: «Вось, воблака малое, нібы далонь чалавечая, падымаецца з мора».
І сказаў [Ільля]: «Ідзі і скажы Ахаву: “Запрагай і ад’яжджай, каб не захапіў цябе дождж!”»
45 І неўзабаве неба пацямнела ад хмараў і ветру, і быў дождж вялікі. А Ахаў сеў у калясьніцу і
паехаў у Езрээль.
46 І рука ГОСПАДА была з Ільлёю. І ён падперазаў паясьніцу сваю, і пабег перад Ахавам аж да
ўваходу ў Езрээль.

1 Вал 19

1 І паведаміў Ахаў Езабэлі ўсё, што зрабіў Ільля і што [Ільля] пазабіваў усіх прарокаў [Баала]
мячом.
2 І Езабэль паслала да Ільлі пасланца, кажучы: «Няхай гэта зробяць мне богі і яшчэ дададуць,
калі заўтра ў гэты час я не зраблю з душою тваёю тое, што зроблена з душою кожнага з іх».
3 І спужаўся Ільля, і ўстаў, і пайшоў, каб [уратаваць] душу сваю. І прыйшоў ён у Бээр-Шэву,
якая ў Юдзе, і пакінуў там юнака свайго.
4 А сам пайшоў у пустыню на дзень дарогі, і прыйшоў, і сеў пад ядлоўцам, і прасіў у душы сваёй
сьмерці, і сказаў: «Досыць ужо, ГОСПАДЗЕ! Вазьмі душу маю, бо я ня лепшы за бацькоў маіх».
5 І лёг ён, і заснуў пад ядлоўцам. І вось, анёл дакрануўся да яго і сказаў яму: «Устань і еш!»
6 І глянуў ён, і вось, каля галавы ягонай аладка печаная і збан вады. І ён еў, і піў, і зноў лёг
спаць.
7 І другі раз вярнуўся анёл ГОСПАДА, і дакрануўся да яго, і сказаў: «Устань і еш, бо доўгі шлях
у цябе [наперадзе]».
8 І ён устаў, і еў, і піў, і, падсілкаваны гэтаю ежаю, ішоў сорак дзён і сорак начэй аж да гары
Божай Харэў.
9 І прыйшоў туды, і начаваў у пячоры. І вось, слова ГОСПАДА да яго, і Ён сказаў яму: «Што ты
тут, Ільля?»
10 А ён адказаў: «Рэўнасьцю я раўную дзеля ГОСПАДА, Бога Магуцьцяў, бо сыны Ізраіля
пакінулі запавет Твой, ахвярнікі Твае разваліліі, а прарокаў Тваіх пазабівалі мячом. Застаўся
я адзін, але і маю душу шукаюць, каб зьнішчыць яе».
11 І сказаў [Госпад]: «Выйдзі і стань на гары перад абліччам ГОСПАДА». І вось, праходзіў
ГОСПАД. І моцны, вялікі вецер пераварочваў горы і разьбіваў скалы перад абліччам ГОСПАДА.
Але ня ў ветры ГОСПАД. А пасьля ветру — землятрус. Але не ў землятрусе ГОСПАД.
12 Пасьля землятрусу — агонь, але не ў агні ГОСПАД. А пасьля агню — подых ціхога ветру.
13 І сталася, калі пачуў [гэта] Ільля, ён закрыў аблічча сваё плашчом сваім, і выйшаў, і стаў
каля ўваходу ў пячору. І вось, голас да яго кажа: «Ільля, што ты тут?»
14 І ён сказаў: «Рэўнасьцю я раўную дзеля ГОСПАДА, Бога Магуцьцяў, бо сыны Ізраіля пакінулі
запавет Твой, ахвярнікі Твае разваліліі, а прарокаў Тваіх пазабівалі мячом. Застаўся я адзін,
але і маю душу шукаюць, каб зьнішчыць яе».
15 І сказаў яму ГОСПАД: «Ідзі і вярніся ў Дамаск шляхам сваім праз пустыню. І прыйдзеш, і
памажаш Хазаэля на валадара Сірыі,
16 і Егу, сына Німшы, памажаш на валадара Ізраіля, а Элісэя, сына Шафата, з Абэль-Мэхолы,
памажаш на прарока замест сябе.
17 І станецца, што хто ўратуецца ад мяча Хазаэля, таго заб’е Егу, а хто ўцячэ ад мяча Егу, таго
заб’е Элісэй.
18 А Я ў Ізраілі пакінуў сем тысячаў тых, якія не схілілі калені перад Баалам і вусны якіх не
цалавалі яго».
19 І пайшоў адтуль [Ільля], і знайшоў Элісэя, сына Шафата. А ён араў, і дванаццаць параў валоў
перад абліччам ягоным, і сам ён быў пры дванаццатай [пары]. І падыйшоў да яго Ільля, і кінуў
на яго плашч свой.
20 І [Элісэй] пакінуў валоў, і пабег за Ільлёю, і сказаў: «Дазволь мне пацалаваць бацьку майго
і маці маю, і я пайду за табой». І ён сказаў яму: «Ідзі і вяртайся, бо што я зрабіў табе?»
21 І [Элісэй] вярнуўся ад яго, і ўзяў пару валоў, і склаў іх у ахвяру, а на ярме валоў зварыў мяса
іхняе і даў народу, і яны елі. І ўстаў, і пайшоў за Ільлёю, і служыў яму.

1 Вал 20

1 А Бэн-Гадад, валадар Сірыі, сабраў усё войска сваё, і трыццаць два валадары [былі] з ім, і коні,
і калясьніцы. І ён пайшоў, і аблёг Самарыю, і ваяваў супраць яе.
2 І паслаў ён пасланцоў да Ахава, валадара Ізраіля, у горад,
3 і сказаў яму: «Гэта кажа Бэн-Гадад. Срэбра тваё і золата тваё — маё, і жонкі твае і сыны твае
найлепшыя — мае».
4 І адказаў валадар Ізраіля, і сказаў: «Паводле слова твайго, гаспадару мой, валадар, і я — твой,
і ўсё маё — тваё».
5 І вярнуліся тыя пасланцы, і сказалі: «Гэта кажа Бэн-Гадад. Вось, я паслаў да цябе, кажучы:
"Срэбра тваё, і золата тваё, і жонак тваіх, і сыноў тваіх ты дасі мне".
6 Заўтра ў гэты час я прышлю слугаў маіх да цябе, і яны перашукаюць дом твой, і дамы слугаў
тваіх, і ўсё, чаго зажадаюць вочы іхнія, возьмуць яны ў рукі свае і забяруць”».
7 І склікаў валадар Ізраіля ўсіх старшыняў зямлі, і сказаў: «Заўважце і паглядзіце, што ён шукае
ліха, бо ён паслаў да мяне па жонак маіх, па сыноў маіх, па срэбра маё і золата маё, і я не
адмовіў яму».
8 І сказалі яму ўсе старшыні і ўвесь народ: «Ня слухай і не згаджайся з ім».
9 І сказаў ён пасланцам Бэн-Гадада: «Скажыце гаспадару майму, валадару: “Усё, па што ты
пасылаў спачатку да слугі твайго, я зраблю, але гэтай рэчы не магу зрабіць”». І вярнуліся
пасланцы, і прынесьлі яму слова.
10 І паслаў іх [зноў] Бэн-Гадад, і сказаў: «Няхай гэта зробяць мне богі і яшчэ дададуць, калі
хопіць пылу Самарыі па жмені для ўсіх людзей, якіх маю пры сабе!»
11 І адказаў валадар Ізраіля, і сказаў: «Скажыце: “Няхай ня хваліцца той, хто падпярэзваецца
[мячом], так, як той, хто яго здымае”».
12 І сталася, калі пачуў гэтае слова [Бэн-Гадад], а ён піў сам і валадары з ім у намётах, ён сказаў
слугам сваім: «Станьце ў шыхт супраць гораду!» І яны сталі ў шыхт.
13 І вось, нейкі прарок наблізіўся да Ахава, валадара Ізраіля, і сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Ці
ты бачыш гэты натоўп вялікі? Вось, Я сёньня аддам яго ў рукі твае, і ты даведаешся, што Я —
ГОСПАД”».
14 І сказаў Ахаў: «Праз каго?» Той сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Праз юнакоў начальнікаў
акругаў”». І ён сказаў: «Хто мае пачаць бой?» Той сказаў: «Ты».
15 І палічыў ён юнакоў начальнікаў акругаў, і было іх дзьвесьце трыццаць два. А пасьля
палічыў увесь народ, усіх сыноў Ізраіля, і налічыў сем тысячаў.
16 І выйшлі яны апоўдні, калі Бэн-Гадад, п’яны, піў у намётах, ён і трыццацьць два валадары,
якія [прыйшлі] яму на дапамогу.
17 І выйшлі найперш юнакі начальнікаў акругаў. І паслаў Бэн-Гадад, і паведамілі яму, кажучы:
«Выйшлі людзі з Самарыі».
18 А ён сказаў: «Калі выйшлі яны з мірам, схапіце іх жывых, а калі ваяваць, таксама вазьміце
іх жывых».
19 А гэта выйшлі з гораду юнакі начальнікаў акругаў і войска, якое ішло за імі.
20 І перамаглі яны тых, што [ішлі] супраць іх. І Сірыйцы пачалі ўцякаць, а Ізраільцяне гналі іх.
І Бэн-Гадад, валадар Сірыі, уцёк на кані з коньнікамі.
21 І выйшаў валадар Ізраіля, і забраў коней і калясьніцы, і зрабіў ён Сірыйцам вялікую паразу.
22 І наблізіўся прарок да валадара Ізраіля, і сказаў яму: «Ідзі, і ўмацуйся, і ведай, і глядзі, што
робіш, бо ў наступным годзе валадар Сірыі пойдзе супраць цябе».
23 А слугі валадара Сірыі сказалі яму: «Бог гор ёсьць Богам іхнім, таму яны былі мацнейшыя
за нас. Але калі мы нападзем на іх на раўніне, мы будзем мацнейшыя за іх.
24 Дык ты зрабі такую рэч: паскідай валадароў з месцаў іхніх, і пастаў на месца іхняе
намесьнікаў.
25 І набяры столькі войска, колькі загінула ў цябе, і коней, колькі было, і калясьніцаў, колькі
было, і будзем ваяваць супраць іх на раўніне, і будзем мацнейшыя за іх». І ён паслухаў голас
іхні, і зрабіў гэтак.
26 І праз год Бэн-Гадад сабраў Сірыйцаў, і пайшоў у Афэк ваяваць з Ізраілем.

27 А сыны Ізраіля сабраліся, і ўзялі харчы, і выйшлі насустрач ім. І разлажыліся табарам сыны
Ізраіля насупраць іх, як два статкі козаў, а Сірыйцы напоўнілі зямлю.
28 І наблізіўся чалавек Божы, і сказаў валадару Ізраіля: «Гэта кажа ГОСПАД: “За тое, што
Сірыйцы сказалі: "ГОСПАД ёсьць Богам гор, а ня Богам раўнінаў", усё гэта вялікае мноства
Я аддам у рукі твае, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД”».
29 І сем дзён стаялі табары адны супраць другіх, а ў сёмы дзень распачаўся бой. І сыны Ізраіля
выбілі ў Сірыйцаў сто тысячаў пяхотнікаў у адзін дзень.
30 А рэшткі [Сірыйцаў] уцяклі ў Афэк, у горад, але на дваццаць сем тысячаў чалавек, якія там
засталіся, заваліўся мур. І Бэн-Гадад уцёк, і хаваўся ў горадзе з пакою ў пакой.
31 І сказалі яму слугі ягоныя: «Вось, мы чулі, што валадары дому Ізраіля — валадары
міласэрныя. Дык апранем рызьзё на сьцёгны свае і вяроўкі на шыі свае, і выйдзем да валадара
Ізраіля. Можа, ён захавае душу тваю».
32 І апранулі яны рызьзё на сьцёгны свае і вяроўкі на шыі свае, і прыйшлі да валадара Ізраіля, і
сказалі: «Слуга твой Бэн-Гадад кажа: “Захавай, прашу, душу маю”». А той сказаў: «Ці ён яшчэ
жывы? Ён — брат мой».
33 І людзі тыя прынялі гэта за добры знак, і пасьпешліва злавілі яго на слове, і сказалі: «Бэн-
Гадад — брат твой». І ён сказаў: «Ідзіце і прывядзіце яго». І прыйшоў да яго Бэн-Гадад, і ён
пасадзіў яго на калясьніцу.
34 І сказаў яму [Бэн-Гадад]: «Гарады, якія бацька мой забраў у бацькі твайго, я вярну. І ты
можаш мець у Дамаску вуліцы, як бацька мой меў у Самарыі». [Ахаў сказаў]: «З гэтым
запаветам адпушчу цябе». І заключыў ён з ім запавет, і адпусьціў яго.
35 І адзін чалавек спаміж сыноў прарокаў сказаў сябру свайму паводле слова ГОСПАДА: «Удар
мяне!» Але той адмовіўся ўдарыць яго.
36 І ён сказаў яму: «За тое, што ты не паслухаў голас ГОСПАДА, вось, ты адыйдзешся ад мяне,
і нападзе на цябе леў!» І калі той адыйшоў ад яго, знайшоў яго леў і забіў яго.
37 А [прарок] знайшоў іншага чалавека і сказаў: «Удар мяне!» І той чалавек ударыў яго, і
скалечыў ударам [сваім].
38 І пайшоў той прарок, і стаў перад валадаром на дарозе, але зьмяніў выгляд, завязаўшы
хустку на вочы сабе.
39 І сталася, калі валадар праходзіў, ён паклікаў валадара і сказаў: «Слуга твой пайшоў
ваяваць, і вось, адзін чалавек прыйшоў, і прывёў некага чалавека да мяне, і сказаў: “Пільнуй
гэтага чалавека! Калі ён прападзе, душа твая будзе за душу ягоную, або адважыш талент
срэбра”.
40 І сталася, калі слуга твой рабіў гэта і гэта, ён зьнік». І сказаў яму валадар Ізраіля: «Такі
прысуд твой, ты сам яго назваў».
41 І ён пасьпешліва зьняў хустку з вачэй сваіх, і валадар Ізраіля пазнаў, што гэта прарок.
42 І [прарок] сказаў яму: «Гэта кажа ГОСПАД: “За тое, што ты выпусьціў з рукі сваёй чалавека
заклятага, душа твая будзе [ўзята] за душу ягоную, і народ твой — за народ ягоны”».
43 І пайшоў валадар Ізраіля ў дом свой сумны і загневаны, і прыйшоў у Самарыю.

1 Вал 21

1 І сталася пасьля тых падзеяў. Набот з Езрээлю меў вінаграднік у Езрээлі побач з палацам
Ахава, валадара Самарыі.
2 І прамовіў Ахаў да Набота, кажучы: «Дай мне вінаграднік твой, а я [зраблю] для сябе сад, бо
ён блізка каля дому майго. І я дам табе за яго лепшы вінаграднік, або калі будзе добра ў вачах
тваіх, дам табе адпаведную плату срэбра».
3 І Набот сказаў Ахаву: «Барані мяне ГОСПАД, каб я аддаў спадчыну бацькоў маіх табе».
4 І прыйшоў Ахаў дадому сумны і загневаны з прычыны таго слова, якое прамовіў да яго Набот
з Езрээлю, які сказаў: «Ня дам табе спадчыны бацькоў маіх». І лёг ён на ложак свой, і адвярнуў
аблічча сваё, і ня еў хлеба.

5 І прыйшла да яго Езабэль, жонка ягоная, і сказала яму: «Чаму смутны дух твой і ты не ясі
хлеба?»
6 І ён сказаў ёй: «Бо гаварыў я з Наботам з Езрээлю і сказаў яму: “Дай мне вінаграднік твой
за срэбра, або, калі хочаш, дам табе за яго другі вінаграднік”. А ён сказаў: “Ня дам табе
вінаграднік мой”».
7 І сказала яму Езабэль, жонка ягоная: «Так ты кіруеш валадарствам Ізраіля! Устань і еш хлеб,
і няхай будзе добра на сэрцы тваім. Я дам табе вінаграднік Набота з Езрээлю».
8 І напісала яна лісты ў імя Ахава, і запячатала іх пячаткай ягонай, і паслала лісты старшыням
і магнатам, якія жылі з Наботам у горадзе ягоным.
9 І напісала яна ў лістах, кажучы: «Абвясьціце пост і пасадзіце Набота перад народам.
10 А насупраць яго пасадзіце двух чалавек, сыноў Бэліяла, і яны засьведчаць супраць яго,
кажучы: “Ты блюзьніў супраць Бога і валадара”. І выведзіце яго, і ўкамянуйце, і забіце [яго]».
11 І людзі гораду ягонага, і старшыні, і магнаты, якія жылі з ім у горадзе ягоным, зрабілі так,
як ім загадала Езабэль і як было напісана ў лістах, які яна паслала ім.
12 І абвясьцілі яны пост, і пасадзілі Набота перад народам.
13 І прыйшлі два сыны Бэліяла, і селі насупраць яго, і сьведчылі супраць Набота сыны Бэліяла
перад народам, кажучы: «Набот блюзьніў супраць Бога і валадара». І вывелі яго за горад, і
ўкаменавалі яго камянямі, і ён памёр.
14 І паслалі яны да Езабэлі, кажучы: «Набот укаменаваны і памёр».
15 І сталася, калі Езабэль пачула, што Набот укаменаваны і памёр, яна сказала Ахаву: «Устань
і вазьмі вінаграднік Набота з Езрээлю, які не згадзіўся за срэбра аддаць яго табе, бо Набот ужо
не жыве, але памёр».
16 І сталася, калі Ахаў пачуў, што Набот памёр, устаў Ахаў і пайшоў у вінаграднік Набота з
Езрээлю, каб узяць яго на ўласнасьць.
17 І было слова ГОСПАДА да Ільлі з Тэшбы, кажучы:
18 «Устань і выйдзі насустрач Ахаву, валадару Ізраіля, які ў Самарыі. Вось, ён у вінаградніку
Набота, куды ён прыйшоў, каб узяць яго на ўласнасьць.
19 І прамовіш да яго, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД: "Ты ўчыніў забойства, а цяпер хочаш узяць
на ўласнасьць?"” І прамовіш да яго, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД: "На тым месцы, на якім
сабакі лізалі кроў Набота, будуць яны лізаць таксама кроў тваю"”.
20 І сказаў Ахаў Ільлі: «Ты знайшоў мяне, вораг мой». А ён сказаў: «Знайшоў, бо ты запрадаўся,
каб чыніць ліхоту ў вачах ГОСПАДА.
21 [Госпад кажа]: “Вось, Я навяду на цябе ліха і вымяту бруд твой, і выб’ю ў Ахава тых, якія
мочацца на сьцяну, і нявольніка, і вольнага ў Ізраілю.
22 І зраблю з домам тваім, як зрабіў з домам Ерабаама, сына Навата, і з домам Баашы, сына
Ахіі, бо ты рабіў усё, каб гнявіць Мяне, і ўводзіў у грэх Ізраіля”.
23 І адносна Езабэль прамовіў ГОСПАД, кажучы: “Езабэль зьядуць сабакі на полі Езрээля.
24 Хто ў Ахава памрэ ў горадзе, таго зьядуць сабакі, а хто памрэ ў полі, таго будуць жэрці
птушкі паднебныя”».
25 Бо не было яшчэ такога, як Ахаў, які запрадаўся рабіць ліхоту ў вачах ГОСПАДА, на што
намовіла яго Езабэль, жонка ягоная.
26 І рабіў ён ганебнае, ходзячы за ідаламі і [робячы] ўсё, што рабілі Амарэйцы, якіх выгнаў
ГОСПАД перад абліччам сыноў Ізраіля.
27 І сталася, калі Ахаў пачуў словы гэтыя, ён разьдзёр адзеньне сваё, апрануў зрэбніцу на цела
сваё, і посьціў, і спаў у зрэбніцы, і хадзіў сумны.
28 І было слова ГОСПАДА да Ільлі з Тэшбы, кажучы:
29 «Ці ты бачыш, як Ахаў упакорыўся перад абліччам Маім? За тое, што ён упакорыўся
перад абліччам Маім, Я не навяду ліха ў дні ягоныя, але ў дні сына ягонага ўчыню ліха дому
ягонаму».

1 Вал 22

1 І жылі тры гады без вайны паміж Сірыяй і Ізраілем.
2 І сталася ў трэці год, прыйшоў Язафат, валадар Юды, да валадара Ізраіля.
3 І валадар Ізраіля сказаў слугам сваім: «Ці вы ня ведаеце, што Рамот Гілеадзкі наш, а мы маўчым, замест таго, каб забраць яго з рук валадара Сірыі?»
4 І сказаў ён Язафату: «Ці ты пойдзеш са мною ваяваць на Рамот Гілеадзкі?» І сказаў Язафат валадару Ізраіля: «Як ты, так і я, і як народ твой, так і народ мой, і як коньнікі твае, так і коньнікі мае».
5 І сказаў Язафат валадару Ізраіля: «Запытайся, калі ласка, сёньня, пра слова ГОСПАДА».
6 І склікаў валадар Ізраіля прарокаў каля чатырохсот чалавек, і сказаў ім: «Ці маю я ісьці ваяваць на Рамот Гілеадзкі, ці не?» І яны сказалі: «Ідзі, і Госпад аддасьць яго ў рукі валадара».
7 І сказаў Язафат: «Ці няма яшчэ прарока ГОСПАДА, каб спытацца ў яго?»
8 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Ёсьць яшчэ адзін чалавек, праз якога можам запытацца ГОСПАДА, але я яго ненавіджу, бо ён не прарочыць мне добрае, але [прарочыць] ліхое. [Гэта] Міхей, сын Імлі». І Язафат сказаў: «Не гавары так, валадар».
9 І паклікаў валадар Ізраіля аднаго эўнуха, і сказаў: «Пасьпяшайся і [прывядзі] Міхея, сына Імлі».
10 А валадар Ізраіля і Язафат, валадар Юды, апранутыя ў шаты ўрачыстыя, сядзелі кожны на пасадзе сваім каля ўваходу ў браму Самарыі, і ўсе прарокі прарочылі перад абліччам іхнім.
11 І Сэдэкія, сын Кенааны, зрабіў сабе рогі жалезныя, і сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Будзеш імі біць Сірыю, пакуль ня зьнішчыш яе”».
12 І ўсе прарокі падобна прарочылі, кажучы: «Ідзі на Рамот Гілеадзкі і перамагай. ГОСПАД аддасьць [яго] ў рукі валадара».
13 А пасланец, які пайшоў паклікаць Міхея, прамовіў да яго, кажучы: «Вось, словы прарокаў у адзін голас [прадказваюць] валадару добрае. Дык няхай слова тваё будзе як кожнага з іх, і прамоў добрае».
14 Але Міхей сказаў: «Як жывы ГОСПАД, што скажа мне ГОСПАД, тое я прамоўлю!»
15 І пайшоў ён да валадара, і валадар сказаў яму: «Міхей, ці маем мы ісьці ваяваць на Рамот Гілеадзкі, ці не?» Ён сказаў: «Ідзі і перамагай, і ГОСПАД аддасьць [яго] ў рукі валадара».
16 І сказаў яму валадар: «Яшчэ раз запрысягаю цябе, каб ты прамовіў мне праўду ў імя ГОСПАДА».
17 І ён сказаў: «Бачыў я ўвесь Ізраіль, расьцярушаны па гарах, як авечкі, якія ня маюць пастуха. І сказаў ГОСПАД: “Ня маюць яны гаспадара. Няхай вяртаецца кожны ў дом свой у супакоі”».
18 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Ці я табе не казаў, што ён не прарочыць мне добрае, але [прарочыць] ліхое?»
19 А той сказаў: «Дзеля гэтага слухай слова ГОСПАДА. Бачыў я ГОСПАДА, Які сядзеў на пасадзе Сваім, і ўсё войска нябеснае стаяла каля Яго праваруч і леваруч.
20 І сказаў ГОСПАД: “Хто намовіць Ахава, каб ён пайшоў і загінуў у Рамоце Гілеадзкім?” І адзін казаў так, а другі іначай.
21 І выйшаў дух, і стаў перад абліччам ГОСПАДА, і сказаў: “Я намоўлю яго”. І сказаў яму ГОСПАД: “Як?”
22 А ён сказаў: “Я выйду і стануся духам хлусьлівым у вуснах усіх прарокаў ягоных”. І [Госпад] сказаў: “Ты намовіш яго, гэта атрымаецца ў цябе. Ідзі і зрабі так!”
23 І цяпер, вось, ГОСПАД даў духа хлусьлівага ў вусны ўсіх прарокаў тваіх, і ГОСПАД прамовіў супраць цябе ліхое».
24 І наблізіўся Сэдэкія, сын Кенааны, і ўдарыў Міхея па абліччы, і сказаў: «Якім чынам адыйшоў Дух ГОСПАДА ад мяне, каб прамаўляць да цябе?»
25 А Міхей сказаў: «Вось, ты ўбачыш той дзень, калі будзеш бегаць з пакою ў пакой, каб схавацца”.
26 І сказаў валадар Ізраіля: «Вазьмі Міхея і завядзі яго да Амона, начальніка гораду, і да Ёаша, сына валадара,

27 і скажы: “Гэта кажа валадар: "Пасадзіце яго ў вязьніцу і карміце яго скупа хлебам і вадой
аж да майго вяртаньня ў супакоі"”».
28 І сказаў Міхей: «Калі ты вернешся ў супакоі, не прамаўляў ГОСПАД праз мяне». І сказаў:
«Слухайце [гэта], усе людзі!»
29 І пайшлі валадар Ізраіля і Язафат, валадар Юды, на Рамот Гілеадзкі.
30 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Я пераапранусь і пайду ў бой, а ты апрані шаты твае». І
валадар Ізраіля зьмяніў адзеньне, і пайшоў у бой.
31 А валадар Сірыі загадаў трыццаці двум возьнікам калясьніцаў, кажучы: «Не ваюйце ані з
вялікім, ані з малым, а толькі супраць валадара Ізраіля».
32 І сталася, калі возьнікі калясьніцаў убачылі Язафата, яны сказалі, што ён — валадар Ізраіля,
і зьвярнуліся супраць яго, каб з ім ваяваць, і Язафат закрычаў.
33 І ўбачылі возьнікі калясьніцаў, што гэта не валадар Ізраіля, і адступіліся ад яго.
34 І адзін ваяр нацягнуў лук, і выпадкова параніў валадара Ізраіля між поясам і панцырам. І
сказаў [валадар] возьніку свайму: «Завярні і вывязі мяне з бою, бо я паранены».
35 І ў той дзень разгарэўся бой, і валадар стаяў у калясьніцы сваёй супраць Сірыйцаў, і памёр
увечары, і кроў з раны сьцякала ў калясьніцу.
36 І на заходзе сонца ў войску закрычалі, кажучы: «Няхай кожны вяртаецца ў горад свой і ў
зямлю сваю!»
37 І памёр валадар, і быў прывезены ў Самарыю, і пахавалі валадара ў Самарыі.
38 І вымылі калясьніцу ягоную ў сажалцы ў Самарыі, і сабакі лізалі кроў ягоную, а блудніцы
мылі яе паводле слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў.
39 А іншыя дзеяньні Ахава, і ўсё, што ён рабіў, і дом з косьці слановай, які ён пабудаваў,
запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
40 І супачыў Ахаў з бацькам сваім, і заваладарыў Ахазія, сын ягоны, пасьля яго.
41 А Язафат, сын Асы, стаў валадаром Юды ў чацьвёртым годзе Ахава, валадара Ізраіля.
42 Язафат меў трыццаць пяць гадоў, калі стаў валадаром, і дваццаць пяць гадоў ён валадарыў
у Ерусаліме. Імя маці ягонай — Азуба, дачка Шылхі.
43 І хадзіў ён усім шляхамі Асы, бацькі свайго, і не зыходзіў з яго, і рабіў тое, што было слушным
у вачах ГОСПАДА.
44 Толькі ўзгоркі не былі зьнішчаныя, і народ яшчэ складаў ахвяры і кадзіў на ўзгорках.
45 І Язафат жыў мірна з валадаром Ізраіля.
46 Іншыя дзеяньні Язафата і мужнасьць ягоная, і што ён рабіў, і як ваяваў, запісаныя ў Кнізе
летапісаў валадароў Юды.
47 А рэшткі распусьнікаў, якія заставаліся ў дні Асы, бацькі ягонага, ён вынішчыў з зямлі.
48 І не было [тады] ў Эдоме валадара, але намесьнік валадарскі.
49 І Язафат пабудаваў караблі ў Таршышы, каб плысьці ў Афір па золата. Але яны не паплылі,
бо паразьбіваліся ў Эцыён-Гэбэры.
50 Тады Ахазія, сын Ахава, сказаў Язафату: «Няхай слугі мае пойдуць на караблях са слугамі
тваімі». Але Язафат не захацеў.
51 І супачыў Язафат з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда, бацькі
свайго, і заваладарыў Егарам, сын ягоны, пасьля яго.
52 Ахазія, сын Ахава, стаў валадаром Ізраіля ў Самарыі ў сямнаццатым годзе Язафата, валадара
Юды, і быў валадаром у Ізраілі два гады.
53 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў шляхам бацькі свайго і шляхам маці сваёй, і
шляхам Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у грэх Ізраіля.
54 І служыў ён Баалу, і пакланяўся яму, і гнявіў ГОСПАДА, Бога Ізраіля, усё так, як рабіў бацька
ягоны.

ДРУГАЯ КНІГА ВАЛАДАРОЎ

1 І збунтаваўся Мааў супраць Ізраіля пасьля сьмерці Ахава.
2 А Ахазія выпаў праз краты з верхняга пакою свайго, які ў Самарыі, і захварэў. І паслаў
ён пасланцоў, і сказаў ім: «Ідзіце, спытайце Баал-Зэбуба, бога Экрону, ці ачуняю я з гэтай
хваробы маёй?»
3 І анёл ГОСПАДА прамовіў да Ільлі з Тэшбы: «Устань, і выйдзі насустрач пасланцам валадара
Самарыі, і прамоў да іх: “Ці ж няма Бога ў Ізраіля, што вы ідзіцё пытацца ў Баал-Зэбуба, бога
Экрону?
4 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: "З ложку, на які ты лёг, ня зыйдзеш з яго, але сьмерцю
памрэш"”». І Ільля пайшоў.
5 І вярнуліся пасланцы да [Ахазіі], і ён сказаў ім: «Чаму вы вярнуліся?»
6 А яны сказалі яму: «Нейкі чалавек выйшаў насустрач нам і сказаў нам: “Ідзіце, і вярніцеся
да валадара, які паслаў вас, і прамоўце да яго: "Гэта кажа ГОСПАД. Ці няма Бога ў Ізраіля,
што ты пасылаеш пытацца ў Баал-Зэбуба, бога Экрону? Дзеля гэтага з ложку, на які ты лёг, ня
зыйдзеш з яго, але сьмерцю памрэш"”».
7 І ён сказаў ім: «Як выглядаў той чалавек, які выйшаў вам насустрач і прамовіў да вас словы
гэтыя?»
8 Яны сказалі яму: «Гэта чалавек касматы і падперазаны пасам скураным вакол сьцёгнаў
сваіх». І ён сказаў: «Гэта Ільля з Тэшбы».
9 І паслаў Ахазія да яго пяцідзясятніка разам з пяцідзесяцьцю ягонымі. І прыйшоў ён да [Ільлі],
які быў на вяршыні гары, і прамовіў да яго: «Чалавек Божы! Валадар гаворыць табе, каб ты
зыйшоў!»
10 І адказаў Ільля, і сказаў пяцідзясятніку: «Калі я — чалавек Божы, няхай зыйдзе агонь з неба
і спаліць цябе і пяцядзясят [чалавек] тваіх!» І зыйшоў агонь з неба, і спаліў яго і пяцьдзясят
[чалавек] ягоных.
11 І паслаў валадар да яго іншага пяцідзясятніка разам з пяцідзесяцьцю ягонымі. І ён адказаў,
і сказаў яму: «Чалавек Божы! Гэта кажа валадар: “Хутка зыйдзі!”»
12 І адказаў Ільля, і сказаў ім: «Калі я — чалавек Божы, няхай зыйдзе агонь з неба і спаліць цябе
і пяцьдзясят [чалавек] тваіх». І зыйшоў агонь Божы з неба, і спаліў яго і пяцьдзясят [чалавек]
ягоных.
13 І паслаў валадар трэцяга пяцідзясятніка разам з пяцідзесяцьцю ягонымі, і ён пайшоў.
І прыйшоў трэці пяцідзясятнік, і ўпаў на калені свае перад Ільлёю, і прасіў яго, і сказаў
яму: «Чалавек Божы! Няхай душа мая і душа гэтых слугаў тваіх, гэтых пяцідзесяці, будуць
каштоўныя ў вачах тваіх!
14 Вось, агонь зыйшоў з неба, і спаліў абодвух папярэдніх пяцідзясятнікаў разам з
пяцідзесяцьцю іхнімі. Але цяпер няхай будзе каштоўная душа мая ў вачах тваіх».
15 І анёл ГОСПАДА прамовіў да Ільлі: «Зыйдзі з ім, ня бойся яго». І [Ільля] ўстаў, і пайшоў з ім
да валадара,
16 і прамовіў да яго: «Гэта кажа ГОСПАД: “За тое, што ты паслаў пасланцоў пытацца ў Баал-
Зэбуба, бога Экрону, нібыта няма Бога ў Ізраіля, каб пытацца пра слова Ягонае, з ложку, на
якім ляжыш, ня зыйдзеш з яго, але сьмерцю памрэш”».
17 І памёр [валадар] паводле слова ГОСПАДА, якое прамовіў Ільля. А замест яго заваладарыў
Ярам у другім годзе Егарама, сына Язафата, валадара Юды, бо [Ахазія] ня меў сына.
18 Іншыя дзеяньні Ахазіі, якія ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.

2 Вал 2

1 І сталася, калі ГОСПАД узяў Ільлю ў неба ў віхуры, ішоў Ільля і Элісэй з Гільгалу.
2 І сказаў Ільля Элісэю: «Застанься тут, бо ГОСПАД паслаў мяне аж у Бэтэль». І сказаў Элісэй:
«Як жывы ГОСПАД і як жывая душа твая, не пакіну цябе». І зыйшлі яны ў Бэтэль.

3 І выйшлі сыны прарокаў, якія ў Бэтэлі, да Элісэя і сказалі яму: «Ці ты ведаеш, што сёньня забярэ ГОСПАД гаспадара твайго па-над галавою тваёй?» Ён сказаў: «Я таксама ведаю, маўчыце».
4 І сказаў яму Ільля: «Элісэй, застанься тут, бо ГОСПАД паслаў мяне ў Ерыхон». А ён сказаў: «Як жывы ГОСПАД і як жывая душа твая, не пакіну цябе». І прыйшлі яны ў Ерыхон.
5 І падыйшлі сыны прарокаў, якія ў Ерыхоне, да Элісэя, і сказалі яму: «Ці ты ведаеш, што сёньня забярэ ГОСПАД гаспадара твайго па-над галавою тваёй?» Ён сказаў: «Я таксама ведаю, маўчыце!»
6 І сказаў яму Ільля: «Застанься тут, бо ГОСПАД паслаў мяне да Ярдану». А ён сказаў: «Як жывы ГОСПАД і як жывая душа твая, не пакіну цябе». І пайшлі яны абодва [разам].
7 І пяцьдзясят чалавек з сыноў прарокаў пайшлі, і сталі насупраць здалёк, а яны абодва сталі каля Ярдану.
8 І Ільля зьняў плашч свой, і скруціў, і ўдарыў ім па вадзе. І разьдзялілася [вада] ў адзін і ў другі бок, і яны перайшлі абодва па сухазем'і.
9 І сталася, калі перайшлі, Ільля сказаў Элісэю: «Прасі, што мне зрабіць табе, пакуль ня буду забраны ад цябе». А Элісэй сказаў: «Няхай, прашу, дух твой [будзе] падвойна на мне!»
10 І [Ільля] сказаў: «Цяжкога ты просіш. Калі ўбачыш мяне, як буду ўзяты ад цябе, будзе табе гэта; а калі ня [ўбачыш], ня будзе».
11 І сталася, калі яны ішлі і размаўлялі, вось, [зьявілася] калясьніца вогненная і коні вогненныя, і разьдзялілі абодвух, і Ільля ў віхуры ўзьняўся ў неба.
12 А Элісэй глядзеў і крычаў: «Ойча мой! Ойча мой! Калясьніца Ізраіля і коньнікі ягоныя». І больш яго ўжо ня бачыў, і схапіў шаты свае, і разьдзёр іх на дзьве часткі.
13 І падняў ён плашч Ільлі, які зваліўся з яго, і вярнуўся, і стаў на беразе Ярдану.
14 І ўзяў плашч Ільлі, які зваліўся з яго, і ўдарыў па вадзе, і сказаў: «Дзе ГОСПАД, Бог Ільлі?» І ўдарыў па вадзе, і яна разьдзялілася ў адзін і ў другі бок, і Элісэй перайшоў.
15 І ўбачылі яго сыны прарокаў, якія [былі] ў Ерыхоне насупраць, і сказалі: «Дух Ільлі супачыў на Элісэі». І прыйшлі на спатканьне яму, і пакланіліся яму да зямлі,
16 і сказалі яму: «Вось, між слугаў тваіх пяцьдзясят чалавек мужных. Няхай яны пойдуць і пашукаюць гаспадара твайго, ці часам не падняў яго Дух ГОСПАДА і не спусьціў на нейкай гары або ў лагчыне». А ён сказаў: «Не пасылайце!»
17 Але яны налягалі на яго і надакучалі, і [Элісэй] сказаў: «Пасылайце». І паслалі яны пяцьдзясят чалавек, і яны шукалі [Ільлю] тры дні, і не знайшлі.
18 І вярнуліся да [Элісэя], а ён быў у Ерыхоне, і ён сказаў ім: «Ці ж не казаў я вам: “Не ідзіце!”»
19 І сказалі жыхары гораду Элісэю: «Вось, разьмяшчэньне гораду гэтага добрае, як гаспадар наш бачыць, але вада кепская і зямля не дае пладоў».
20 і ён сказаў: «Прынясіце мне новую місу і ўкіньце туды солі». І яны прынесьлі яму.
21 І ён пайшоў да крыніцы вады, і ўкінуў туды соль, і сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Я аздаравіў ваду гэтую, і ня будзе тут больш ані сьмерці, ані бясплоднасьці”».
22 І аздароўлена была вада па сёньняшні дзень паводле слова Элісэя, якое ён прамовіў.
23 І адтуль пайшоў ён у Бэтэль. І калі ён ішоў дарогаю, малыя хлопцы выбеглі з гораду і сьмяяліся з яго, і казалі яму: «Ідзі, лысы! Ідзі, лысы!»
24 Ён павярнуўся да іх, і паглядзеў на іх, і пракляў іх у імя ГОСПАДА. І выйшлі дзьве мядзьведзіцы з лесу, і разарвалі сорак двух хлопцаў з іх.
25 Адтуль пайшоў ён на гару Кармэль, а адтуль вярнуўся ў Самарыю.

2 Вал 3

1 А Ярам, сын Ахава, заваладарыў над Ізраілем у Самарыі ў васямнаццатым годзе Язафата, валадара Юды, і валадарыў дванаццаць гадоў.
2 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, але ня так, як бацька ягоны і маці ягоная. І ён прыбраў слуп Баала, які зрабіў бацька ягоны.

3 Толькі да грахоў Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у грэх Ізраіля, ён прыляпіўся і не адступіў ад іх.
4 А Мэша, валадар Мааву, быў гадоўцам авечак і даваў валадару Ізраіля сто тысячаў авечак і воўну са ста тысячаў бараноў.
5 І сталася пасьля сьмерці Ахава, што валадар Мааву збунтаваўся супраць валадара Ізраіля.
6 І валадар Ярам у той дзень выйшаў з Самарыі і палічыў усяго Ізраіля.
7 І пайшоў, і паслаў да Язафата, валадара Юды, кажучы: «Валадар Мааву збунтаваўся супраць мяне. Ці пойдзеш са мною ваяваць супраць Мааву?» Той сказаў: «Пайду. Як ты, так і я, як народ твой, так і народ мой, як коні твае, так і коні мае».
8 І сказаў: «Якім шляхам мы пойдзем?» А той сказаў: «Шляхам праз пустыню Эдом».
9 І вырушылі валадар Ізраіля, валадар Юды і валадар Эдому. І ішлі яны па шляху сем дзён, і не было вады для войска і жывёлы, якая ішла з імі.
10 І сказаў валадар Ізраіля: «Бяда! бо паклікаў ГОСПАД трох валадароў, каб аддаць іх у рукі Мааву».
11 І сказаў Язафат: «Ці няма тут прарока ГОСПАДАВАГА, каб праз яго спытаць ГОСПАДА?» І адказаў адзін са слугаў валадара Ізраіля, і сказаў: «Тут Элісэй, сын Шафата, які паліваў вадой рукі Ільлі».
12 І сказаў Язафат: «Ён мае слова ГОСПАДА». І пайшлі да яго валадар Ізраіля, і Язафат, і валадар Эдому.
13 І сказаў Элісэй валадару Ізраіля: «Што табе і мне? Ідзі да прарокаў бацькі твайго і да прарокаў маці тваёй». І сказаў яму валадар Ізраіля: «Ці не паклікаў ГОСПАД трох валадароў гэтых, каб аддаць іх у рукі Мааву?»
14 І сказаў Элісэй: «Як жывы ГОСПАД Магуцьцяў, перад абліччам Якога я стаю, калі б я не паважаў Язафата, валадара Юды, не зьвярнуў бы ўвагі на цябе і ня глянуў бы.
15 А цяпер прывядзіце да мяне гусьляра». І сталася, калі гусьляр зайграў, лягла на Элісэя рука ГОСПАДА,
16 і ён сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Выкапайце ў гэтай лагчыне роў за ровам”.
17 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Ня ўбачыце ветру, і ня ўбачыце дажджу, а лагчына гэтая напоўніцца вадою. І будзеце піць вы, і статак ваш, і жывёла вашая”.
18 І гэтага яшчэ мала ў вачах ГОСПАДА. І Ён выдасьць Мааў у рукі вашыя.
19 І вы зруйнуеце ўсе гарады ўмацаваныя і ўсе гарады багатыя, і вы сьсячыце ўсе дрэвы добрыя, і засыпеце ўсе крыніцы водаў, і на ўсе палі абрабляныя добрыя накідаеце камянёў».
20 І сталася раніцаю ў час складаньня ахвяры, вось, вада пацякла дарогаю Эдомскай, і напоўнілася зямля вадою.
21 А ўсе Мааўляне пачулі, што надыходзяць валадары, каб ваяваць супраць іх, і склікалі ўсіх, здольных насіць зброю, і сталі на мяжы.
22 І ўсталі рана раніцаю, і ўзыходзіла сонца над вадою, і ўбачылі Мааўляне здалёк ваду чырвоную, як кроў.
23 І сказалі яны: «Гэта кроў! Рэжучыся, рэжуцца валадары, і пазабівалі адзін аднаго. І цяпер [хадзем] па здабычу, Мааўляне!»
24 І падыйшлі яны да табару Ізраіля, і ўсталі Ізраільцяне, і пабілі Мааўлянаў, і тыя ўцякалі перад абліччам іхнім, а яны ішлі сярод іх і забівалі Мааўлянаў.
25 І зруйнавалі гарады, і закідалі палі добрыя камянямі, і засыпалі ўсе крыніцы водаў, і зрэзалі ўсе дрэвы добрыя. Засталіся толькі муры Кір-Харэшэту, і атачылі яго каменякіды, і закідвалі камянямі.
26 І ўбачыў валадар Мааву, што перамагаюць ворагі ягоныя, і ён узяў з сабой семсот чалавек, якія трымаюць меч, каб прабіцца да валадара Эдому, але ня змог.
27 І ўзяў ён сына свайго першароднага, які пасьля яго меў валадарыць, і склаў яго ў ахвяру цэласпаленьня на мурах. І паўстала вялікае абурэньне ў Ізраільцянаў, і яны адыйшлі ад яго, і вярнуліся ў зямлю сваю.

2 Вал 4

1 Адна ўдава спасярод жонак сыноў прарокаў клікала да Элісэя, кажучы: «Мой муж, слуга
твой, памёр. А ты ведаеш, што слуга твой баяўся ГОСПАДА. Але прыйшоў ліхвяр, каб забраць
сабе абодвух дзяцей маіх у нявольнікі».
2 І сказаў ёй Элісэй: «Што магу зрабіць для цябе? Скажы мне, што маеш у доме сваім?» Яна
сказала: «Служка твая ня мае ў доме анічога, акрамя збанка з алеем».
3 І сказаў [Элісэй]: «Ідзі, пазыч сабе посуд у-ва ўсіх суседзяў сваіх, посуд пусты, і [набяры] яго
нямала.
4 І вярніся, і замкні дзьверы за сабою і сынамі тваімі, і налівай у-ва ўсе гэтыя пасудзіны, а
напоўненыя адстаўляй».
5 І яна пайшла ад яго, і замкнула дзьверы за сабою і за сынамі сваімі, і яны падносілі ёй посуд,
а яна налівала.
6 І сталася, калі ўвесь посуд быў поўны, сказала яна сыну свайму: «Прынясі мне яшчэ
пасудзіну». Але ён сказаў ёй: «Ня маю больш посуду». І спыніўся алей.
7 І пайшла яна, і паведаміла чалавеку Божаму, а ён сказаў ёй: «Ідзі, прадай алей і вярні доўг
пазычальніку твайму. А ты і сыны твае жывіце з таго, што засталося».
8 І сталася, што аднаго дня Элісэй праходзіў праз Шунэм. І там багатая жанчына затрымала
яго, каб паеў хлеба. І колькі разоў ён там праходзіў, заходзіў туды падсілкавацца хлебам.
9 І сказала яна мужу свайму: «Вось, я ведаю, што той чалавек Божы, які заўсёды праходзіць
каля нас, — сьвяты.
10 Дык зробім верхні пакойчык, і паставім у ім ложак, стол, зэдлік і сьвечнік, і станецца, калі
ён зойдзе да нас, застанецца там».
11 І сталася аднаго дня, што ён зайшоў туды, і падняўся ў верхні пакойчык, і там заначаваў.
12 І сказаў ён слузе свайму Гехазію: «Пакліч Шунамянку гэтую». І ён паклікаў яе, і яна стала
перад абліччам ягоным.
13 І сказаў [Элісэй слузе]: «Скажы ёй: “Вось, ты так рупішся пра нас з такой руплівасьцю. Што
зрабіць для цябе? Можа, пагаварыць праа цябе з валадаром або з начальнікам войска?”» А яна
сказала: «Я жыву сярод народу свайго».
14 І ён сказаў: «Дык што зрабіць для яе?» І Гехазі сказаў: «На жаль, яна ня мае сына, а муж
ейны стары».
15 І [Элісэй] сказаў: «Пакліч яе!» І ён паклікаў яе, і яна стала каля дзьвярэй.
16 І ён сказаў: «У вызначаны час паводле часу жыцьця ты будзеш песьціць сына». І яна
адказала: «Гаспадару мой, чалавек Божы, не падманвай служкі тваёй».
17 І зачала жанчына, і нарадзіла сына ў вызначаны час паводле часу жыцьця, як прамовіў да
яе Элісэй.
18 І рос той хлопчык. І сталася аднаго дня, што пайшоў ён да бацькі свайго, да жняцоў,
19 і сказаў ён бацьку свайму: «Галава мая! Галава мая!» І [бацька] сказаў слузе: «Занясі яго да
маці ягонай!»
20 Забраў яго [слуга] і занёс да маці ягонай. І ён сядзеў на каленях у яе да паўдня, і памёр.
21 Яна ўзыйшла, і палажыла яго ў ложак чалавека Божага, і замкнула за сабою [дзьверы], і
выйшла.
22 І паклікала яна мужа свайго, і сказала: «Прыйшлі мне, калі ласка, аднаго са слугаў і асьліцу,
і я пайду да чалавека Божага, і вярнуся».
23 І ён сказаў ёй: «Навошта ідзеш да яго сёньня? Не маладзік [цяпер], не субота» Але яна
сказала: «Супакой [няхай будзе]».
24 І яна асядлала асьліцу, і сказала слузе свайму: «Вядзі і ідзі! Не затрымоўвайся ў дарозе,
пакуль не скажу табе».
25 І пайшла, і прыйшла да чалавека Божага на гару Кармэль. І сталася, калі чалавек Божы
ўгледзеў яе здалёк, ён сказаў слузе свайму Гехазію: «Вось, тая Шунамянка.
26 Пабяжы насустрач ёй і скажы ёй: “Ці супакой у цябе? Ці супакой у мужа твайго? Ці супакой
у сына твайго?”» І яна сказала: «Супакой».

27 І прыйшла яна на гару да чалавека Божага, і абняла ногі ягоныя, а Гехазі падыйшоў, каб
адсунуць яе, але сказаў чалавек Божы: «Пакінь яе, бо душа ейная ў горычы, а ГОСПАД схаваў
гэта ад мяне і не паведаміў мне».
28 А яна сказала: «Ці я прасіла гаспадара майго пра сына? Ці ж я не казала: “Не падманвай
мяне”?»
29 І [Элісэй] сказаў Гехазію: «Падперажы сьцёгны твае, і вазьмі кій мой у руку тваю, і ідзі! Калі
сустрэнеш каго, не вітайся з ім, а калі цябе хто прывітае, не адказвай яму. І паложыш кій мой
на аблічча хлопчыка».
30 І маці хлопца сказала: «Як жывы ГОСПАД і як жывая душа твая, не пакіну цябе!» І [Элісэй]
устаў, і пайшоў з ёю.
31 А Гехазі выперадзіў іх і палажыў кій на аблічча хлопца, але не было ані голасу, ані знаку
[жыцьця]. І Гехазі вярнуўся да яго, і паведаміў яму, кажучы: «Хлопец не прачнуўся».
32 І ўвайшоў Элісэй у дом, і вось, хлопчык ляжыць мёртвы на ложку ягоным.
33 І ўвайшоў ён, і замкнуў дзьверы за сабою, і маліў ГОСПАДА.
34 І падыйшоў, і лёг на хлопчыка, і прытуліў вусны свае да вуснаў ягоных, і вочы свае да вачэй
ягоных, і далоні свае да далоняў ягоных, і прыціснуўся да яго, і грэў цела хлопчыка.
35 І вярнуўся, і хадзіў па доме туды і сюды, і ўзыйшоў, і прыціснуўся да яго, і хлопец пазяхнуў
сем разоў і расплюшчыў хлопец вочы свае.
36 І паклікаў [Элісэй] Гехазія, і сказаў: «Пакліч Шунамянку гэтую». І той паклікаў яе, і яна
ўвайшла да яго, і ён сказаў: «Вазьмі сына твайго».
37 І яна ўвайшла, і ўпала да ног ягоных, і пакланілася да зямлі, і ўзяла сына свайго, і выйшла.
38 А Элісэй вярнуўся ў Гільгал. І быў голад у зямлі. І сыны прарокаў сядзелі перад абліччам
ягоным, і ён сказаў слузе свайму: «Пастаў вялікі кацёл і звары поліўку для сыноў прарокаў».
39 І выйшаў адзін з іх у поле назьбіраць зеляніны. І знайшоў ён дзікую расьліну, і назьбіраў з яе
дзікіх пладоў поўны плашч свой. І ён вярнуўся, і накідаў іх у кацёл з поліўкай, а ён ня ведаў,
што гэта была [за расьліна].
40 І налілі людзям есьці. І калі яны паелі поліўку, закрычалі і сказалі: «Сьмерць у катле,
чалавек Божы!» І не маглі есьці.
41 І сказаў [Элісэй]: «Прынясіце мукі». І насыпаў ён [яе] ў кацёл, і сказаў: «Наліце людзям». І
елі, і ў катле не было нічога ліхога.
42 І прыйшоў чалавек з Баал-Шалішу, і прынёс чалавеку Божаму хлеб з пяршынаў: дваццаць
хлябоў ячменных і сьвежае збожжа ў мяху. І сказаў [Элісэй]: «Дайце людзям, і няхай яны
ядуць».
43 І сказаў паслугач ягоны: «Як я дам гэта сотні людзей?» А ён сказаў: «Дай людзям, і няхай
ядуць, бо гэта кажа ГОСПАД: “Ешце і застанецца [яшчэ]”».
44 І ён даў ім, і яны насыціліся, і яшчэ засталося паводле слова ГОСПАДА.

2 Вал 5

1 Нааман, начальнік войска валадара Сірыі, быў чалавек вялікі перад абліччам гаспадара
свайго і быў вельмі паважаны, бо праз яго ГОСПАД даў перамогу Сірыі. І быў ён волат мужны,
але [ён быў] пракажоны.
2 І вырушылі войскі Сірыйцаў, і ўзялі ў палон з зямлі Ізраіля малую дзяўчынку, і была яна
перад абліччам жонкі Наамана.
3 І сказала яна гаспадыні сваёй: «О, каб гаспадар мой [стаў] перад абліччам прарока, які ў
Самарыі! Ён аздаравіў бы яго ад праказы ягонай!»
4 І пайшоў Нааман, і паведаміў гаспадару свайму, кажучы: «Вось так і так сказала дзяўчынка
з зямлі Ізраіля».
5 І валадар Сірыі сказаў: «Ідзі, а я пашлю ліст да валадара Ізраіля». І ён пайшоў, і ўзяў у руку
сваю дзесяць талентаў срэбра, і шэсьць тысячаў [сыкляў] золата, і дзесяць зьменаў адзеньня.
6 І прынёс ён валадару Ізраіля ліст, які казаў: «Калі прыйшоў ліст гэты да цябе, вось, я пасылаю
да цябе Наамана, слугу майго, каб ты аздаравіў яго ад праказы ягонай».

7 І сталася, калі валадар Ізраіля прачытаў ліст гэты, ён разьдзёр шаты свае і сказаў: «Ці ж я
— Бог, каб забіваць і вяртаць жыцьцё, што ён прысылае да мяне, каб я аздаравіў чалавека ад
праказы ягонай? Падумайце і паглядзіце, ці ён не зачэпкі шукае супраць мяне?»
8 І сталася, калі пачуў Элісэй, чалавек Божы, што валадар Ізраіля разьдзёр шаты свае, ён
паслаў да валадара, кажучы: «Навошта разьдзёр ты шаты свае? Няхай ён прыйдзе да мяне
і даведаецца, што ёсьць прарок у Ізраілі».
9 І прыйшоў Нааман з коньмі сваімі і калясьніцаю сваёй, і затрымаўся каля дзьвярэй дому
Элісэя.
10 І Элісэй паслаў да яго пасланца, кажучы: «Ідзі і памыйся сем разоў у Ярдане, і цела тваё
станецца [здаровым], і ты будзеш ачышчаны [ад праказы]».
11 І загневаўся Нааман, і адыйшоў, і сказаў: «Вось, я казаў сабе, што ён выйдзе [да мяне], і
стане, і будзе клікаць імя ГОСПАДА, Бога свайго, і дакранецца рукой сваёй месца [праказы], і
аздаровіць ад праказы.
12 Ці ня лепшыя Абана і Фарпар, рэкі Дамаску, за ўсе рэкі Ізраіля? Ці ж ня мог я памыцца ў іх і
быць ачышчаным?» І павярнуўся, і пайшоў у гневе.
13 І наблізіліся слугі ягоныя, і прамовілі да яго: «Бацька мой, калі б пра рэчы вялікія прамовіў
да цябе прарок, ці ты не зрабіў бы? А тым больш, калі ён сказаў табе: “Памыйся і будзеш
ачышчаны”».
14 І зыйшоў Нааман, і сем разоў занурыўся ў Ярдан паводле слова чалавека Божага. І
аднавілася цела ягонае, як цела малога хлопца, і быў ён ачышчаны.
15 І вярнуўся да чалавека Божага ён і ўся дружына ягоная, і стаў перад абліччам ягоным, і
сказаў: «Вось, я даведаўся, што на ўсёй зямлі няма Бога, але толькі ў Ізраілі! І цяпер, калі
ласка, прымі дар ад слугі твайго».
16 І сказаў [Элісэй]: «Як жывы ГОСПАД, перад абліччам Якога я стаю, не вазьму». А той моцна
прасіў яго ўзяць, але ён не згадзіўся.
17 І сказаў Нааман: «Калі не, няхай слузе твайму дадуць зямлі, колькі пара мулаў можа несьці,
бо слуга твой ужо ня будзе складаць цэласпаленьні і ахвяры крывавыя іншым багам, але толькі
ГОСПАДУ!
18 Адно толькі няхай прабачыць ГОСПАД слузе твайму: калі гаспадар мой уваходзіць у дом
Рымона, каб пакланіцца там, ён абапіраецца на руку маю, і тады я мушу пакланіцца ў доме
Рымона. Калі я буду пакланяцца ў доме Рымона, няхай даруе ГОСПАД слузе твайму гэта».
19 І [Элісэй] сказаў яму: «Ідзі ў супакоі». І ён адыйшоў ад яго кавалак дарогі.
20 І сказаў Гехазі, слуга чалавека Божага: «Вось, гаспадар мой пашкадаваў Наамана Сірыйца,
не прыняў ад яго таго, што ён прынёс. Як жывы ГОСПАД, пабягу за ім і нешта атрымаю ад яго».
21 І пабег Гехазі за Нааманам. І ўбачыў Нааман, што нехта бяжыць за ім, і зыйшоў з калясьніцы
насустрач яму, і сказаў: «Ці з мірам?»
22 Ён сказаў: «З мірам. Гаспадар мой паслаў мяне, кажучы: “Вось, цяпер прыйшлі да мяне з
гары Эфраіма два юнакі з сыноў прарокаў. Дай ім талент срэбра і дзьве зьмены адзеньня”».
23 І сказаў Нааман: «Лепш вазьмі два таленты». І ўпрошваў яго, і завязаў два таленты срэбра
ў дзьве кайстры, і дзьве зьмены адзеньня, і даў двум слугам сваім, і яны панесьлі іх перад
абліччам ягоным.
24 І прыйшоў ён у Афэль, і забраў [рэчы гэтыя] з рук іхніх, і палажыў у доме, а людзей тых
выправіў, і яны пайшлі.
25 І ён пайшоў, і стаў перад гаспадаром сваім. І сказаў яму Элісэй: «Адкуль ты [прыйшоў],
Гехазі?» Ён сказаў: «Слуга твой не хадзіў нікуды».
26 А ён сказаў яму: «Ці ж сэрца маё не ішло [з табою], калі насустрач табе зыйшоў чалавек той
з калясьніцы сваёй? Ці [цяпер]час браць срэбра і адзеньне, або аліўкавыя дрэвы, вінаграднікі,
авечак і валоў, нявольнікаў і нявольніцаў?
27 Няхай праказа Наамана прылепіцца да цябе і да насеньня твайго на вякі». І выйшаў [Гехазі]
ад яго [белы], як сьнег, ад праказы.

2 Вал 6

1 І сказалі сыны прарокаў Элісэю: «Вось, месца, у якім мы перад абліччам тваім жывем, цеснае
для нас.
2 Няхай мы пойдзем да Ярдану і возьмем адтуль кожны па адным бервяне, і зробім сабе месца
на пражываньне». Ён сказаў: «Ідзіце!»
3 І сказаў нехта: «Ідзі таксама і ты са слугамі тваімі». І ён адказаў: «Пайду».
4 І пайшоў ён з імі. І прыйшлі яны да Ярдану, і секлі дрэвы.
5 І сталася, калі адзін сек бервяно, сякера ягоная ўпала ў ваду. І закрычаў ён, і сказаў: «Аёй,
гаспадару мой! Яна ж пазычаная!»
6 І сказаў чалавек Божы: «Дзе яна ўвалілася?» І той паказаў яму месца. І адсек ён [кавалак]
дрэва, і ўкінуў туды, і выплыла сякера.
7 І ён сказаў: «Вазьмі яе!» І той выцягнуў руку сваю, і ўзяў яе.
8 А валадар Сірыі ваяваў з Ізраілем. І радзіўся ён са слугамі сваімі, кажучы: «У такім і такім
месцы зробім засаду».
9 А паслаў чалавек Божы да валадара Ізраіля, кажучы: «Сьцеражыцеся пераходзіць у тым
месцы, бо там заляглі Сірыйцы».
10 І валадар Ізраіля паслаў [людзей] у тое месца, пра якое сказаў яму чалавек Божы і
перасьцерагаў яго, і ўсьцярог сябе так ня раз і ня два.
11 І ўстрывожылася сэрца валадара Сірыі дзеля гэтай справы. І склікаў ён слугаў сваіх, і сказаў
ім: «Чаму вы не паведамляеце мне, хто [здраджвае] нас валадару Ізраіля?»
12 І сказаў адзін са слугаў ягоных: «Ніхто, гаспадару мой, валадар, бо прарок Элісэй, які ў
Ізраілі, паведамляе валадару Ізраіля словы, якія ты гаворыш у спальні сваёй».
13 І ён сказаў: «Ідзіце і даведайцеся, дзе ён, а я пашлю і вазьму яго». І паведамілі яму, кажучы:
«Вось, [ён] у Датане».
14 І паслаў ён туды коней, калясьніцы і моцную дружыну ваяроў. І прыйшлі яны ўначы, і
атачылі горад.
15 І ўстаў рана слуга чалавека Божага, і выйшаў, і вось, войска вакол гораду, коні і калясьніцы.
І сказаў [Элісэю] юнак ягоны: «Аёй, гаспадару мой! Што будзем рабіць?»
16 А ён сказаў: «Ня бойся. Болей тых, хто з намі, чым тых, хто з імі».
17 І маліўся Элісэй, і сказаў: «ГОСПАДЗЕ, адкрый вочы ягоныя, і ён убачыць». І адкрыў ГОСПАД
вочы юнаку, і ён убачыў, і вось, гара поўная коней і калясьніцаў вогненных вакол Элісэя.
18 І калі Сірыйцы зыходзілі да яго, Элісэй маліўся да ГОСПАДА і сказаў: «Дакраніся да народу
гэтага сьлепатою!» І ўдарыў іх [Госпад] сьлепатою, паводле слова Элісэя.
19 І сказаў ім Элісэй: «Гэта ня тая дарога і ня той горад. Ідзіце за мною, і я завяду вас да
чалавека, якога вы шукаеце». І ён завёў іх у Самарыю.
20 І сталася, калі прыйшлі яны ў Самарыю, сказаў Элісэй: «ГОСПАДЗЕ, адкрый вочы іхнія, каб
бачылі». І адкрыў ГОСПАД вочы іхнія, і яны ўбачылі, і вось, яны пасярод Самарыі.
21 І сказаў валадар Ізраіля Элісэю, калі ўбачыў іх: «Ці маю, забіваючы, забіць іх, бацька мой?»
22 Але [Элісэй] сказаў: «Не забівай. Ці ж мячом тваім і лукам тваім ты ўзяў іх у палон, каб іх
забіваць? Дай ім хлеба і вады, каб паелі і напіліся, і няхай ідуць да гаспадара свайго».
23 І справіў ім [валадар] вялікае частаваньне, і яны елі і пілі, і ён выправіў іх, і яны пайшлі да
гаспадара свайго. І ўжо дружыны Сірыйцаў не прыходзілі больш у зямлю Ізраіля.
24 І сталася пасьля таго, што Бэн-Гадад, валадар Сірыі, сабраў усё войска сваё, і пайшоў, і аблёг
Самарыю.
25 І быў голад вялікі ў Самарыі, бо вось, аблягалі яе. І галава асла [каштавала] восемдзясят
срэбнікаў, а чвэрць каба галубячага лайна — пяць срэбнікаў.
26 І сталася, калі валадар Ізраіля абыходзіў муры, адна жанчына закрычала да яго, кажучы:
«Ратуй мяне, гаспадару мой, валадар!»
27 І сказаў ён: «Калі ня выратуе цябе ГОСПАД, як я выратую цябе? З гумна або з тоўчні?»
28 І сказаў ёй валадар: «Што табе?» Яна сказала: «Гэтая жанчына сказала мне: “Дай сына
твайго, і мы зьямо яго сёньня, а сына майго зьямо заўтра”.

29 І зварылі мы сына майго, і зьелі яго, і на другі дзень я сказала ёй: “Дай сына твайго, і мы
зьямо яго”, але яна схавала сына свайго».
30 І сталася, калі пачуў валадар слова жанчыны, ён разьдзёр шаты свае. А ён абыходзіў муры,
і народ глядзеў, і вось, зрэбніца пад сподам на целе ягоным.
31 І сказаў ён: «Няхай гэта і гэта зробіць мне Бог і яшчэ дадасьць, калі галава Элісэя, сына
Шафата, застанецца на ім сёньня!»
32 А Элісэй сядзеў у доме сваім, і старшыні сядзелі з ім. І валадар паслаў перад абліччам сваім
чалавека, але перш, чым пасланец увайшоў да [Элісэя], ён сказаў старшыням: «Ці вы бачыце,
што гэты сын забойцы паслаў чалавека, каб сьцяць галаву маю? Глядзіце, калі прыйдзе
пасланец, замкніце дзьверы і перахапіце яго ў дзьвярах. Ужо чуваць тупат ног гаспадара
ягонага за ім».
33 І калі ён яшчэ гаварыў з імі, вось, валадар зыйшоў да яго і сказаў: «Вось, колькі ліхоты ад
ГОСПАДА! Што яшчэ маю чакаць ад ГОСПАДА?»

2 Вал 7

1 І сказаў Элісэй: «Слухайце слова ГОСПАДА. Гэта кажа ГОСПАД: “Заўтра ў гэты час сэя
найчысьцейшай мукі будзе за адзін сыкль, і дзьве сэі ячменю [будуць] за адзін сыкль у браме
Самарыі”».
2 І адказаў збраяносец, на руку якога абапіраўся валадар, і сказаў чалавеку Божаму: «Хоць бы
[нават] ГОСПАД зрабіў вокны ў небе, ня можа стацца слова гэтае». І [Элісэй] сказаў: «Вось, ты
ўбачыш вачыма сваімі, але есьці гэтага ня будзеш!»
3 І былі чацьвёра пракажоных каля ўваходу ў браму. І сказалі яны адзін аднаму: «Навошта мы
тут сядзім, [чакаючы] сьмерці?
4 Калі скажам: "Хадзем у горад", у горадзе голад, і мы там памром; калі будзем сядзець тут,
[таксама] памром. І цяпер хадзем, пойдзем у табар Сірыйцаў. Калі пашкадуюць нас, будзем
жыць, а калі заб'юць, тады памром».
5 І ўсталі яны ў поцемках, каб пайсьці ў табар Сірыйцаў. І дайшлі да краю табару Сірыйцаў, і
вось, нікога там няма.
6 Бо ў табары Сірыйскім даў Госпад чуць голас калясьніцаў, коней і войска вялікага, і сказалі
яны адзін аднаму: «Вось, валадар Ізраіля наняў супраць нас валадароў Хетаў і валадароў
Эгіпецкіх, каб ішлі супраць нас».
7 І ўсталі яны, і ўцяклі ў поцемках, і пакінулі намёты свае, коней сваіх і аслоў сваіх у табары,
як былі, і ратавалі душы свае.
8 І прыйшлі тыя пракажоныя да краю табару, і ўвайшлі ў адзін намёт, і елі, і пілі, і ўзялі там
срэбра і золата, і адзеньне, і пайшлі, і схавалі. І вярнуліся, і ўвайшлі ў іншы намёт, і там узялі,
і пайшлі, і схавалі.
9 І сказалі яны адзін аднаму: «Ня так мы робім, як трэба. Дзень гэты — дзень радаснай весткі,
а мы маўчым. Калі будзем адкладаць аж да сьвятла раніцы, спаткае нас кара. Хадземце,
пойдзем і паведамім дому валадара».
10 І прыйшлі яны, і паклікалі вартаўнікоў гораду, і паведамілі ім, кажучы: «Пайшлі мы ў табар
Сірыйцаў, і вось, там няма нікога, і няма голасу Сірыйцаў а толькі коні і аслы прывязаныя, і
намёты, як былі».
11 І вартаўнікі закрычалі, і паведамілі дому валадара.
12 І ўстаў валадар уначы, і сказаў слугам сваім: «Скажу вам, што зрабілі Сірыйцы. Яны
ведаюць, што мы галодныя, і яны выйшлі з табару, каб схавацца ў полі, кажучы: “Калі яны
выйдуць з гораду, мы захопім іх жывымі і ўвойдзем у горад”».
13 І адказаў адзін са слугаў ягоных, і сказаў: «Возьмем пяць коней, якія засталіся ў [горадзе],
бо толькі яны засталіся з усяго мноства Ізраіля, якое загінула, і пойдзем, і ўбачым».
14 І ўзялі дзьве калясьніцы з коньмі, і валадар паслаў іх у табар Сірыйскі, кажучы: «Ідзіце і
паглядзіце!»
15 І пайшлі яны за імі аж да Ярдану, і вось, уся дарога поўная адзеньня і рэчаў, якія кідалі
Сірыйцы, уцякаючы. І вярнуліся пасланцы, і паведамілі валадару.

16 І выйшаў народ, і рабаваў табар Сірыйцаў. І была сэя найчысьцейшай мукі за адзін сыкль, і
дзьве сэі ячменю за адзін сыкль, паводле слова ГОСПАДА.
17 І валадар прызначыў таго збраяносца, на руку якога абапіраўся, [вартаваць] каля брамы.
І народ затаптаў яго ў браме, і ён памёр, як прамовіў чалавек Божы, прамаўляючы, калі
прыходзіў валадар да яго.
18 І было, калі чалавек Божы прамовіў да валадара, кажучы: «Заўтра ў гэты час дзьве сэі
ячменю будуць у браме Самарыі за адзін сыкль, і адна сэя найчысьцейшай мукі за адзін сыкль,
19 адказаў збраяносец чалавеку Божаму: «Хоць бы [нават] ГОСПАД зрабіў вокны ў небе, ня
можа стацца слова гэтае», а той сказаў: «Вось, ты ўбачыш вачыма сваімі, але есьці гэтага ня
будзеш».
20 І сталася так, і затаптаў яго народ у браме, і ён памёр.

2 Вал 8

1 І Элісэй прамовіў да той жанчыны, сына якой уваскрасіў, кажучы: «Устань і ідзі ты і дом
твой, і абжывіся на чужыне, бо ГОСПАД вырашыў пра голад, які прыходзіць на зямлю гэтую на
сем гадоў».
2 І ўстала жанчына, і зрабіла, як сказаў чалавек Божы. І пайшла яна і дом ейны, і абжылася ў
зямлі Філістынцаў на сем гадоў.
3 І сталася праз сем гадоў, што жанчына вярнулася з зямлі Філістынцаў, і пайшла яна да
валадара прасіць пра [вяртаньне] дому свайго і поля свайго.
4 А валадар размаўляў з Гехазіем, слугою чалавека Божага, кажучы: «Раскажы мне пра ўсе
вялікія справы, якія ўчыніў Элісэй».
5 І калі ён расказваў валадару пра тое, як [Элісэй] уваскрасіў мёртвага, вось, жанчына, сына
якой ён уваскрасіў, прасіла валадара пра [вяртаньне] дому свайго і поля свайго. І сказаў
Гехазі: «Гаспадару мой, валадар, гэта тая жанчына і гэта той сын ейны, якога ўваскрасіў
Элісэй».
6 І спытаўся валадар жанчыну пра гэта, і яна расказала яму. І валадар даў ёй аднаго ўрадоўца,
кажучы: «Вярні ёй усё, што яе, і ўсе прыбыткі з поля ад дня, у які пакінула яна зямлю, і аж да
цяпер».
7 І прыйшоў Элісэй у Дамаск, а ў той час хварэў Бэн-Гадад, валадар Сірыі. І паведамілі яму,
кажучы: «Прыйшоў сюды чалавек Божы».
8 І сказаў валадар Хазаэлю: «Вазьмі ў рукі твае дары і ідзі насустрач чалавеку Божаму, і
спытайся ГОСПАДА пра знак, кажучы: "Ці я ачуняю з хваробы гэтай?"»
9 І пайшоў Хазаэль на спатканьне [з Элісэем], і ўзяў дары ў рукі свае, і ўсе багацьці Дамаску
наладаваў на сорак вярблюдаў. І прыйшоў ён, і стаў перад абліччам ягоным, і сказаў: «Сын
твой Бэн-Гадад, валадар Сірыі, паслаў мяне да цябе, кажучы: “Ці я ачуняю з хваробы гэтай?”»
10 І Элісэй сказаў яму: «Ідзі і скажы яму: “Ачуняеш”. Але ГОСПАД паказаў мне, што ён сьмерцю
памрэ».
11 І наставіў Элісэй вочы свае на яго, і доўга ўглядаўся, аж той засмуціўся. І пачаў плакаць
чалавек Божы.
12 І сказаў Хазаэль: «Чаму плача гаспадар мой?» А ён сказаў: «Бо я ведаю, якое ліха ты
зробіш сынам Ізраіля: умацаваньні іхнія спаліш агнём, юнакоў іхніх выб’еш мячом, дзяцей
іхніх разьдзярэш і цяжарных жанчынаў іхніх пасячэш».
13 І сказаў Хазаэль: «Хто такі слуга твой, гэты сабака, каб рабіў такія вялікія рэчы?» І сказаў
Элісэй: «ГОСПАД паказаў мне цябе як валадара Сірыі».
14 І пайшоў ён ад Элісэя, і прыйшоў да гаспадара свайго. А той сказаў яму: «Што сказаў табе
Элісэй?» І ён сказаў: «Ён сказаў мне, што ачуняеш».
15 І сталася на наступны дзень, [Хазаэль] узяў посьцілку, і намачыў у вадзе, і палажыў на твар
ягоны, і ён памёр. І Хазаэль стаў валадаром замест яго.
16 У пяты год Ярама, сына Ахава, валадара Ізраіля, Егарам, сын Язафата, валадара Юды, стаў
валадаром Юды.
17 Меў ён трыццаць два гады, калі пачаў валадарыць і восем гадоў валадарыў у Ерусаліме.

18 І хадзіў ён шляхам валадароў Ізраіля, як рабіў дом Ахава, бо дачка Ахава была жонкай
ягонай, і рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА.
19 Але ГОСПАД не хацеў зьнішчыць Юды дзеля Давіда, слугі Свайго, бо Ён казаў яму, што дасьць
сьветач яму і сынам ягоным у-ва ўсе дні.
20 У дні ягоныя збунтаваўся Эдом, каб [ня быць] пад рукой Юды, і паставіў сабе валадара.
21 І пайшоў Егарам у Цаір, і ўсе калясьніцы ягоныя з ім. І ўстаў ён уначы, і ўдарыў Эдомцаў,
якія атачылі яго і начальнікаў калясьніцаў, і ўцёк народ у намёты свае.
22 Але Эдом узбунтаваўся і [выйшаў] з-пад рукі Юды па сёньняшні дзень. У той час
узбунтавалася [таксама] Лібна.
23 А іншыя дзеяньні Егарама, і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.,
24 І супачыў Егарам з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда. І
заваладарыў Ахазія, сын ягоны, пасьля яго.
25 У дванаццатым годзе Ярама, сына Ахава, валадара Ізраіля, пачаў валадарыць Ахазія, сын
Егарама, валадара Юды.
26 Ахазія меў дваццаць два гады, калі стаў валадаром, і адзін год валадарыў у Ерусаліме. Імя
маці ягонай — Аталія, дачка Омры, валадара Ізраіля.
27 І ён хадзіў шляхамі дому Ахава, і рабіў ліхоту ў вачах ГОСПАДА, як дом Ахава, бо быў ён
сваяком дому Ахава.
28 І пайшоў ён з Ярамам, сынам Ахава, ваяваць супраць Хазаэля, валадара Сірыі, у Рамот
Гілеадзкі, і Сірыйцы паранілі Ярама.
29 І вярнуўся валадар Ярам у Езрээль, каб лячыцца ад ранаў, якімі паранілі яго Сірыйцы ў
Рамоце, калі ён ваяваў супраць Хазаэля, валадара Сірыі. І Ахазія, сын Егарама, валадар Юды,
пайшоў адведаць Ярама, сына Ахава, у Езрээль, бо той быў хворы.

2 Вал 9

1 І прарок Элісэй паклікаў аднаго з сыноў прарокаў, і сказаў яму: «Падпержы сьцёгны твае і
вазьмі пасудзіну з алеем у руку тваю, і ідзі ў Рамот Гілеадзкі.
2 І прыйдзеш туды, і ўбачыш Егу, сына Язафата, сына Німшы, і ўвойдзеш, і возьмеш яго
спасярод братоў ягоных, і ўвядзеш яго ва ўнутранны пакой.
3 І возьмеш пасудзіну з алеем, і выльеш на галаву ягоную, і скажаш: “Гэта кажа ГОСПАД: "Я
памазваю цябе на валадара Ізраіля"”. І адчыніш дзьверы, і ўцячэш адтуль без затрымкі».
4 І пайшоў у Рамот Гілеадзкі той юнак, слуга прарока.
5 І ён прыйшоў, кі вось, сядзелі начальнікі войска. І ён сказаў: «Маю для цябе, князь, слова». І
сказаў Егу: «Для каторага з нас?» А ён сказаў: «Для цябе, князь».
6 І ён устаў, і ўвайшоў у дом, і [юнак] выліў алей на галаву ягоную, і сказаў яму: «Гэта кажа
ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я памазваю цябе на валадара для народу ГОСПАДА, для Ізраіля.
7 І ты зьнішчыш дом Ахава, гаспадара твайго, і адпомсьціш за кроў слугаў Маіх, прарокаў, і за
кроў усіх слугаў ГОСПАДА, якія [загінулі] ад рукі Езабэлі.
8 І загіне ўвесь дом Ахава, і Я вынішчу ў Ахава тых, якія мочацца на сьцяну, і нявольніка, і
вольнага ў Ізраілі.
9 І Я зраблю з домам Ахава так, як [зрабіў] з домам Ерабаама, сына Навата, і з домам Баашы,
сына Ахіі.
10 А Езабэль зьядуць сабакі на полі Езрээль, і ня будзе каму пахаваць яе”». І адчыніў ён дзьверы,
і ўцёк.
11 А Егу выйшаў да слугаў гаспадара свайго, і яны сказалі яму: «Ці з мірам? Навошта прыходзіў
да цябе гэты шаленец?» І ён сказаў ім: «Вы ведаеце гэтага чалавека і прамову ягоную».
12 Але яны адказалі: «Няпраўда! Раскажы нам!» І ён сказаў: «Так і так сказаў ён мне, кажучы:
“Гэта кажа ГОСПАД: "Я памазваю цябе на валадара для Ізраіля"”».
13 І яны ўзялі пасьпешліва плашчы свае, і разаслалі перад ім на прыступках, і затрубілі ў рог,
і сказалі: «Егу валадарыць!»
14 І Егу, сын Язафата, сына Німшы, зрабіў змову супраць Ярама. А Ярам і ўвесь Ізраіль баранілі
Рамот Гілеадзкі супраць Хазаэля, валадара Сірыі.

15 І вярнуўся Ярам валадар, каб лекаваць у Езрээлі раны, якія зрабілі яму Сірыйцы ў бітве супраць Хазаэля, валадара Сірыі. І сказаў Егу: «Калі душы вашыя са мною, няхай ніхто не выходзіць з гораду, каб занесьці вестку ў Езрээль».
16 І сеў Егу на калясьніцу, і паехаў у Езрээль, бо Ярам ляжаў там, а Ахазія, валадар Юды, зыйшоў адведаць Ярама.
17 І вартаўнік, які стаяў на вежы ў Езрээлі, убачыў дружыну Егу, як ён ішоў, і сказаў: «Бачу дружыну». Ярам сказаў: «Вазьмі коньніка і пашлі насустрач ім, і няхай ён скажа: “Ці з мірам [едзеце]?”»
18 І паехаў коньнік насустрач яму, і сказаў: «Гэта кажа валадар: “Ці з мірам [едзеш]?”» Сказаў яму Егу: «Што табе да гэтага? Едзь за мною». І вартаўнік паведаміў, кажучы: «Прыйшоў да іх пасланец, але не вяртаецца».
19 І [Ярам] паслаў другога коньніка. І той пад’ехаў да іх, і сказаў: «Гэта кажа валадар: “Ці з мірам?”» А Егу сказаў яму: «Што табе да гэтага? Едзь за мною».
20 І вартаўнік паведаміў, кажучы: «Прыйшоў ён да іх, але не вяртаецца. А едуць яны, быццам едзе Егу, сын Німшы, бо ён шалёна езьдзіць».
21 І Ярам сказаў: «Запрагай [калясьніцу]!» І запрэглі калясьніцу ягоную, і Ярам, валадар Ізраіля, і Ахазія, валадар Юды, кожны ў калясьніцы сваёй, выехалі насустрач Егу, і спаткалі яго на полі Набота з Езрээлю.
22 І сталася, калі Ярам убачыў Егу, ён сказаў: «Ці з мірам ты, Егу?» Той сказаў: “Што [значыць] “з мірам”, калі [працягваецца] распуста Езабэлі, маці тваёй, і чараўніцтва ейнае».
23 І павярнуў Ярам руку сваю, і кінуўся ўцякаць, і сказаў Ахазіі: «Здрада, Ахазія!»
24 А Егу нацягнуў лук і прабіў Ярама паміж плячыма ягонымі, і страла прайшла праз сэрца ягонае, і ён схіліўся на калясьніцу сваю.
25 І сказаў [Егу] Бідкару, збраяносцу свайму: «Вазьмі і кінь яго на поле Набота з Езрээлю! Бо ўзгадай, што я і ты ехалі ўдвух за Ахавам, бацькам ягоным, Ахавам, і ГОСПАД узлажыў на яго цяжар:
26 “Учора Я бачыў кроў, кроў Набота і кроў сыноў ягоных, кажа ГОСПАД. І Я адплачу табе на гэтым полі, кажа ГОСПАД”. І цяпер вазьмі і кінь яго на поле гэтае паводле слова ГОСПАДА».
27 А Ахазія, валадар Юды, убачыў [гэта], і ўцякаў шляхам на Бэт-Гаган. І дагнаў яго Егу, і сказаў: «Гэтага таксама забіце!» І [паранілі] яго ў калясьніцы ягонай на ўзгорку Гур, які пры Іблеаме, але ён уцёк у Мэгіддо і там памёр.
28 І слугі ягоныя прывезлі яго ў Ерусалім, і пахавалі яго ў магіле ягонай з бацькамі ягонымі ў горадзе Давіда.
29 У адзінаццатым годзе Ярама, сына Ахава, Ахазія стаў валадаром Юды.
30 І ўвайшоў Егу ў Езрээль, а Езабэль пачула [пра гэта], і падмалявала сабе вочы, і аздобіла галаву, і выглядала праз вакно.
31 І калі Егу ўваходзіў праз браму, яна сказала: «Ці з мірам ты, Зімры, які забіў гаспадара свайго?»
32 І Егу ўзьняў аблічча сваё ў бок вакна і сказаў: «Хто са мною, хто?» І нахіліліся да яго два ці тры эўнухі.
33 І ён сказаў: «Скіньце яе!» І скінулі яе, і крывёй ейнаю залілася сьцяна і коні, якія тапталі яе.
34 І ўвайшоў [Егу], і еў, і піў, і сказаў: «Ідзіце, знайдзіце тую праклятую, і пахавайце яе, бо яна — дачка валадара».
35 І выйшлі, каб пахаваць яе, і не знайшлі нічога, толькі чэрап, ногі і далоні рук.
36 І вярнуліся, і расказалі яму. І ён сказаў: «Такое слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў праз слугу Свайго Ільлю з Тэшбы, кажучы: “На полі Езрээль сабакі будуць есьці цела Езабэлі.
37 І парэшткі Езабэлі будуць, як гной, на абліччы поля ў Езрээлі, так што ня можна будзе сказаць: "Гэта Езабэль"”».

2 Вал 10

1 А ў Самарыі было семдзясят сыноў Ахава. І Егу напісаў лісты, і выслаў іх у Самарыю да князёў Езрээля, і да старшыняў, і да апекуноў дзяцей Ахава, кажучы:

2 «Цяпер, калі прыйдзе да вас ліст гэты, а з вамі сыны гаспадара вашага, калясьніцы, коні, горад
умацаваны і зброя,
3 выберыце найлепшага і найсправядлівейшага з сыноў гаспадара вашага, і пасадзіце яго на
пасад бацькі ягонага, і ваюйце за дом гаспадара вашага».
4 Але яны спалохаліся вельмі-вельмі і сказалі: «Вось, два валадары не змаглі ўстаяць перад
абліччам ягоным, а як мы застанемся?»
5 І загадчык дому, і начальнікі гораду, і старшыні, і апекуны паслалі да Егу, кажучы: «Мы —
слугі твае, і ўсё, што ты скажаш, зробім, і ня будзем нікога рабіць валадаром. Што добрае ў
вачах тваіх, рабі».
6 І Егу напісаў ім другі ліст, кажучы: «Калі вы са мною і слухаеце голас мой, тады вазьміце
галовы сыноў гаспадара вашага і прыйдзіце да мяне заўтра ў гэты час у Езрээль». А сыны
валадара, семдзясят чалавек, былі на выхаваньні ў магнатаў гораду.
7 І сталася, калі ліст гэты прыйшоў да іх, яны ўзялі сыноў валадара, семдзясят чалавек, і забілі.
І галовы іхнія склалі ў кашы, і паслалі да яго ў Езрээль.
8 І прыйшоў пасланец, і паведаміў яму, кажучы: «Прынесьлі галовы сыноў валадарскіх». Ён
сказаў: «Улажыце іх у два стосы каля ўваходу ў браму аж да раніцы».
9 І сталася раніцаю, ён выйшаў, і стаў, і сказаў усяму народу: «Вы праведныя. Вось, я змовіўся
супраць гаспадара майго і забіў яго. Але хто забіў усіх гэтых?
10 Ведайце цяпер, што нішто ня ўпала на зямлю са словаў ГОСПАДА, якія Ён прамовіў супраць
дому Ахава. ГОСПАД зьдзейсьніў тое, што прамовіў праз слугу Свайго Ільлю».
11 І забіў Егу ўсіх, хто застаўся з дому Ахава ў Езрээлі, усіх магнатаў ягоных, дарадцаў ягоных
і сьвятароў ягоных, і не засталося з іх аніводнага.
12 І ўстаў, і пайшоў, і ішоў у Самарыю. І быў у дарозе каля Бэт-Экед-Гераім.
13 І вось, сустрэў [Егу] братоў Ахазіі, валадара Юды, і сказаў ім: «Хто вы?» А яны сказалі: «Мы
— браты Ахазіі, і мы прыйшлі прывітаць сыноў валадара і сыноў валадаркі».
14 А ён сказаў: «Схапіце іх жывымі!» І схапілі іх жывымі, і забілі іх каля студні Бэт-Экеду, сорак
два чалавекі, і ён не пашкадаваў з іх аніводнага.
15 І пайшоў адтуль [Егу], і сустрэў Ёнадава, сына Рэхава, які выйшаў яму на спатканьне, і
дабраславіў яго, і сказаў [Ёнадаву]: «Ці сэрца тваё шчырае да мяне, як сэрца маё да цябе?»
Ёнадаў сказаў: «Так». [Сказаў Егу]: «Калі так, дай мне руку тваю». І [Ёнадаў] даў яму руку
сваю, і ён пасадзіў яго пры сабе ў калясьніцу,
16 і сказаў: «Ідзі са мной і пабач руплівасьць маю дзеля ГОСПАДА». І ехаў ён з ім у калясьніцы
ягонай.
17 І прыехаў ён у Самарыю, і пазабіваў усіх, якія былі засталіся з [дому] Ахава ў Самарыі аж да
зьнішчэньня іх паводле слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў праз Ільлю.
18 І сабраў Егу ўвесь народ, і казаў ім: «Ахаў мала служыў Баалу. Егу будзе яму служыць болей.
19 І цяпер паклічце да мяне ўсіх прарокаў Баала і ўсіх, хто служыць яму, і ўсіх сьвятароў
ягоных. Кожны мусіць прыйсьці, бо [будзе] вялікая ахвяра Баалу. Хто ня прыйдзе, ня будзе
жыць». А Егу рабіў гэта падступна, каб вынішчыць усіх, хто служыць Баалу.
20 І сказаў Егу: «Сьвяткуйце ўрачыстасьць Баала». І абвясьцілі [сьвята].
21 І паслаў Егу да ўсяго Ізраіля, і прыйшлі ўсе, хто служыў Баалу, і не застаўся ніводзін, які б
не прыйшоў. І прыйшлі яны ў дом Баала, і напоўнілі дом Баала ад уваходу да ўваходу.
22 І сказаў [Егу] загадчыку шатні [валадарскай]: «Вынесі адзеньне для ўсіх служыцеляў Баала».
І ён вынес ім адзеньне.
23 І ўвайшлі Егу і Ёнадаў, сын Рэхава, у дом Баала, і Егу сказаў служыцелям Баала:
«Перашукайце і перагледзьце, ці няма тут часам з вамі служыцеля ГОСПАДА, але каб былі
толькі служыцелі Баала».
24 І ўвайшлі яны, каб скласьці ахвяры і цэласпаленьні. А Егу паставіў звонку восемдзясят
чалавек і сказаў: «Хто дазволіць уцячы аднаму з гэтых людзей, якіх я прыводжу ў рукі вашыя,
душа ягоная [будзе] за душу тую».

25 І сталася, калі скончылі складаць цэласпаленьні, Егу сказаў варце сваёй і збраяносцам:
«Ідзіце і забіце іх, няхай ніводзін не ўцячэ!» І пазабівалі іх варта і збраяносцы вострывам мяча,
і кінулі [трупы іхнія], і ўвайшлі ў гарады, [дзе былі] дамы Баала.
26 І ўзялі яны слупы дому Баала, і спалілі іх,
27 і разьбілі ідалаў Баала, і зруйнавалі дом Баала, і замянілі яго на месца нячыстае аж да сёньня.
28 І зьнішчыў Егу Баала ў Ізраілі.
29 Але не адступіў Егу ад грахоў Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у грэх Ізраіля, і [не пакінуў]
ён залатых быкоў, якія ў Бэтэлі і Дане.
30 І ГОСПАД сказаў Егу: «За тое, што ты добра выканаў тое, што слушнае ў вачах Маіх, і ўсё,
што было ў сэрцы Маім адносна дому Ахава, сыны твае будуць сядзець на пасадзе Ізраіля аж
да чацьвёртага пакаленьня».
31 Але Егу не пільнаваўся хадзіць паводле закону ГОСПАДА, Бога Ізраіля, усім сэрцам сваім, і
не адступіў ён ад грахоў Ерабаама, які ўвёў у грэх Ізраіля.
32 У тыя дні пачаў ГОСПАД разьдзіраць Ізраіль. І пабіў іх Хазаэль у-ва ўсіх межах Ізраіля,
33 ад Ярдану на ўсход сонца, усю зямлю Гілеад, Гада, Рубэна і Манасу, ад Араэру, які над ракою
Арнон, Гілеад, і Башан.
34 А іншыя дзеяньні Егу, і ўсё, што ён зрабіў, і мужнасьць ягоная запісаныя ў Кнізе летапісаў
валадароў Ізраіля.
35 І супачыў Егу з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў Самарыі. І заваладарыў Егаахаз, сын ягоны,
пасьля яго.
36 А дзён, калі валадарыў Егу над Ізраілем у Самарыі — дваццаць восем гадоў.

2 Вал 11

1 Калі Аталія, маці Ахазіі, убачыла, што сын ейны памёр, яна ўстала і выбіла ўсё насеньне
валадарскае.
2 Але Егашэва, дачка валадара Егарама, сястра Ахазіі, узяла Ёаша, сына Ахазіі, і выкрала яго
спасярод забіваных сыноў валадара разам з карміцелькай ягонай, і схавала яго перад Аталіяй
у пакоі спальным, і ня быў ён забіты.
3 І хаваўся ён з ёй шэсьць гадоў у Доме ГОСПАДА, а Аталія валадарыла ў зямлі [Юды].
4 А ў сёмы год Егаяда паслаў і ўзяў сотнікаў, і Керэтаў, і варту, і ўвёў іх да сябе ў Дом ГОСПАДА,
і заключыў з імі запавет, і запрысягнуў іх у Доме ГОСПАДА, і паказаў ім сына валадара.
5 І загадаў ім, кажучы: «Гэта слова, якое вы маеце выканаць. Трэцяя частка вас, якія
прыходзіце ў суботу, будзе вартаваць пры доме валадара,
6 трэцяя частка — пры браме Сур, і трэцяя частка — пры браме, якая за вартоўняй, і вартаваць
Дом, каб не было пашкоджаньня.
7 І дзьве дружыны з вас, усе, што адыходзяць у суботу, будуць вартаваць пры Доме ГОСПАДА,
пры валадару.
8 І атачыце валадара кругом, і зброя вашая ў руцэ вашай. І хто ўвойдзе да шыхтоў, няхай будзе
забіты. І будзеце вы з валадаром, калі ён уваходзіць і выходзіць».
9 І зрабілі сотнікі ўсё, як ім загадаў Егаяда сьвятар. І ўзяў кожны людзей сваіх, якія прыходзілі
ў суботу і адыходзілі ў суботу, і прыйшлі да Егаяды сьвятара.
10 І сьвятар раздаў сотнікам дзіды і шчыты валадара Давіда, якія [былі] ў Доме ГОСПАДА.
11 І стала варта, кожны са зброяй у руцэ сваёй ад правага боку Дому аж да левага боку Дому,
перад ахвярнікам і Домам вакол валадара.
12 І вывеў [Егаяда] сына валадара, і ўсклаў на яго карону, і [даў Каўчэг] Сьведчаньня. І паставілі
яны яго валадаром, і памазалі яго, і пляскалі ў далоні, і казалі: «Няхай жыве валадар!»
13 І пачула Аталія гоман народу, і выйшла да народу ў Дом ГОСПАДА.
14 І ўбачыла, і вось, валадар стаіць на ўзвышэньні паводле звычаю, і князі, і трубы каля
валадара, і ўвесь народ зямлі радуецца і трубіць у трубы. І разьдзёрла Аталія шаты свае, і
закрычала: «Змова, змова!»

15 А Егаяда сьвятар загадаў сотнікам і начальнікам войска, і сказаў: «Выведзіце яе з Дому за
агароджу, а калі хто пойдзе за ёй, няхай памрэ ад мяча». Бо сьвятар сказаў: «Няхай яна ня
будзе забітая ў Доме ГОСПАДА».
16 І ўзлажылі рукі на яе, і пацягнулі яе дарогай, па якой уяжджаюць коні ў дом валадара, і там
была яна забітая.
17 І заключыў Егаяда запавет паміж ГОСПАДАМ і валадаром і народам, каб былі яны народам
ГОСПАДА, і паміж валадаром і народам.
18 І ўвесь народ зямлі ўвайшоў у дом Баала, і зруйнавалі яго, і ахвярнікі ягоныя і балваноў
ягоных разьбілі ўшчэнт, а Маттана, сьвятара Баала, забілі перад ахвярнікамі. І сьвятар [Егаяда]
паставіў варту пры Доме ГОСПАДА.
19 І ўзяў ён сотнікаў, Керэтаў і варту, і ўвесь народ зямлі, і вывелі яны валадара з Дому
ГОСПАДА, і павялі праз браму варты ў дом валадара, і ён сеў на пасадзе валадарскім.
20 І радаваўся ўвесь народ зямлі, і горад быў у супакоі. А Аталію забілі мячом у доме валадара.

2 Вал 12

1 Ёаш меў сем гадоў, калі стаў валадаром.
2 У сёмым годзе валадараньня Егу Ёаш стаў валадаром і валадарыў сорак гадоў у Ерусаліме.
Імя маці ягонай — Цыбэя з Бээр-Шэвы.
3 І рабіў Ёаш слушнае ў вачах ГОСПАДА ў-ва ўсе дні, пакуль вучыў яго сьвятар Егаяда.
4 Толькі ўзгоркі не былі зьнішчаныя, і народ складаў яшчэ ахвяры і кадзіў на ўзгорках.
5 І сказаў Ёаш сьвятарам: «Усё срэбра пасьвячонае, якое прыносяць у Дом ГОСПАДА срэбра
тых, што прыходзяць, і срэбра [выкупу] за душу, і срэбра, якое паводле рашэньня сэрца свайго
прыносяць у Дом ГОСПАДА,
6 няхай бяруць сьвятары ад знаёмых сваіх, і няхай ужываюць на направу пашкоджаньняў у
Доме [Божым] паўсюль, дзе будзе знойдзена пашкоджаньне».
7 Але яшчэ да дваццаць трэцяга году валадара Ёаша сьвятары не направілі пашкоджаньняў у
Доме [Божым].
8 І паклікаў валадар Ёаш сьвятара Егаяду і сьвятароў, і спытаўся ў іх: «Чаму вы не напраўляеце
пашкоджаньняў у Доме [Божым]? І цяпер не бярыце болей срэбра ад знаёмых вашых, але
аддайце яго на аднаўленьне Дому [Божага]».
9 І згадзіліся сьвятары ня браць срэбра ад народу, і не займацца направаю пашкоджаньняў
Дому [Божага].
10 І ўзяў сьвятар Егаяда скрыню, і зрабіў адтуліну зьверху яе, і паставіў яе побач з ахвярнікам
з правага боку каля ўваходаў у Дом ГОСПАДА. І сьвятары, што вартавалі парогі, складалі ў яе
ўсё срэбра, якое прыносілі ў Дом ГОСПАДА.
11 І калі яны бачылі, што ўжо шмат срэбра ў скрыні, прыходзілі пісар валадара і сьвятар вялікі,
і забіралі срэбра, якое знаходзілася ў Доме ГОСПАДА, і лічылі яго.
12 І аддавалі гэтае пералічанае срэбра загадчыкам работаў, якія наглядалі за працаю ў Доме
ГОСПАДА. І яны выдавалі іх на цесьляроў і будаўнікоў, якія працавалі ў Доме ГОСПАДА,
13 і на муляроў, і на каменяроў, і на набыцьцё дрэва і чэсаных камянёў для направы
пашкоджаньняў Дому ГОСПАДА, і на ўсякія іншыя выдаткі для адбудовы Дому [Божага].
14 Аднак са срэбра, што прынесьлі ў Дом ГОСПАДА, не рабілі келіхі срэбныя, нажніцы,
крапільніцы, трубы або іншыя рэчы залатыя ці срэбныя для Дому ГОСПАДА,
15 бо давалі яго работнікам, што напраўлялі Дом ГОСПАДА.
16 І не правяралі людзей, якім давалі срэбра для выплаты работнікам, бо яны рабілі ўсё
сумленна.
17 Але срэбра ахвяры за правіну і срэбра ахвяры за грэх ня ўносілі ў Дом ГОСПАДА, бо яно
належала сьвятарам.
18 У той час Хазаэль, валадар Сірыі, пайшоў ваяваць з Гатам, і здабыў яго. І павярнуў Хазаэль
аблічча сваё, каб ісьці на Ерусалім.

19 І ўзяў Ёаш, валадар Юды, усе рэчы сьвятыя, якія ахвяравалі Язафат, Егарам, Ахазія, бацькі
ягоныя, валадары Юды, і тое, што ён сам ахвяраваў, усё золата, якое мог знайсьці ў скарбніцы
Дому ГОСПАДА і ў доме валадара, і паслаў Хазаэлю, валадару Сірыі, і ён адступіў ад Ерусаліму.
20 А іншыя дзеяньні Ёаша і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
21 І паўсталі слугі ягоныя, і змовіліся, і забілі Ёаша ў Бэт-Мілло, на дарозе ў Сіллу.
22 Ёзавад, сын Шымэата, і Егазавад, сын Шамэра, слугі ягоныя, забілі яго, і ён памёр. І пахавалі
яго з бацькамі ягонымі ў горадзе Давіда. І заваладарыў Амазія, сын ягоны, пасьля яго.

2 Вал 13

1 У дваццаць трэцім годзе Ёаша, сына Ахазіі, валадара Юды, Егаахаз, сын Егу, стаў валадаром
Ізраіля ў Самарыі на сямнаццаць гадоў.
2 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў у грахах Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у грэх
Ізраіля, і не адварочваўся ад іх.
3 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА супраць Ізраіля, і аддаў іх ГОСПАД у рукі Хазаэля, валадара Сірыі,
і ў рукі Бэн-Гадада, сына Хазаэля, у-ва ўсе дні тыя.
4 І маліўся Егаахаз перад абліччам ГОСПАДА, і выслухаў яго ГОСПАД, бо Ён бачыў уціск Ізраіля,
як прыціснуў іх валадар Сірыі.
5 І даў ГОСПАД Ізраілю збаўцу, і быў ён вызвалены з рукі Сірыі. І жылі сыны Ізраіля ў намётах
сваіх, як учора і пазаўчора.
6 Аднак не адвярнуліся яны ад грахоў дому Ерабаама, які ўвёў у грэх Ізраіля, і хадзілі ў іх, і
нават Астарта стаяла ў Самарыі.
7 І засталося ў Егаахаза з войска толькі пяцьдзясят коньнікаў, дзесяць калясьніцаў і дзесяць
тысячаў пяхотнікаў, бо выбіў іх валадар Сірыі і зрабіў іх як пыл на патаптаньне.
8 А іншыя дзеяньні Егаахаза і ўсё, што ён зрабіў, і мужнасьць ягоная запісаныя ў Кнізе летапісаў
валадароў Ізраіля.
9 І супачыў Егаахаз з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў Самарыі. І стаў валадаром Егааш, сын
ягоны, пасьля яго.
10 У трыццаць сёмым годзе Ёаша, валадара Юды, Егааш, сын Егаахаза, стаў валадаром Ізраіля
ў Самарыі на шаснаццаць гадоў.
11 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і не адступіў ад усіх грахоў Ерабаама, сына Навата, які
ўвёў у грэх Ізраіля, і хадзіў у іх.
12 А іншыя дзеяньні Егааша і ўсё, што ён зрабіў, і мужнасьць ягоная, калі ён ваяваў супраць
Амазіі, валадара Юды, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
13 І супачыў Егааш з бацькамі сваімі, і Ерабаам сеў на пасадзе ягоным. І быў пахаваны Егааш у
Самарыі з валадарамі Ізраіля.
14 А Элісэй захварэў немаччу, ад якой потым памёр. І прыйшоў да яго Егааш, валадар Ізраіля,
і плакаў перад абліччам ягоным, і казаў: «Ойча мой, ойча мой! Калясьніца Ізраіля і коньнікі
ягоныя!»
15 І сказаў яму Элісэй: «Вазьмі лук і стрэлы!» І ён прынёс яму лук і стрэлы.
16 І сказаў ён валадару Ізраіля: «Палажы руку сваю на лук!» І валадар палажыў руку сваю, а
Элісэй палажыў рукі свае на рукі валадара
17 і сказаў: «Адчыні вакно на ўсход». І ён адчыніў, і сказаў Элісэй: «Страляй!» І ён стрэліў, а
[Элісэй] сказаў: «Страла перамогі ГОСПАДА і страла перамогі над Сірыяй. Ты паб'еш Сірыю ў
Афэку дашчэнту».
18 І сказаў: «Вазьмі стрэлы!» І [Егааш] узяў іх, а [Элісэй] сказаў яму: «Удар па зямлі!» І ён
ударыў тры разы, і спыніўся.
19 І загневаўся чалавек Божы на яго, і сказаў: «Трэба было ўдарыць пяць або шэсьць разоў.
Тады ты перамог бы Сірыю цалкам, а цяпер пераможаш Сірыю толькі тры разы!»
20 І памёр Элісэй, і пахавалі яго. А дружыны Мааву нападалі на зямлю [Ізраіля], прыходзячы
штогод.

21 І сталася, калі хавалі аднаго чалавека, вось, убачылі дружыну [Мааву], і кінулі чалавека таго
ў магілу Элісэя, і ўцяклі. І калі чалавек той дакрануўся да костак Элісэя, ён аджыў і стаў на
ногі свае.
22 А Хазаэль, валадар Сірыі, уціскаў Ізраіля ў-ва ўсе дні Егаахаза.
23 І зьлітаваўся ГОСПАД над імі, і зьявіў літасьць, і зьвярнуўся да іх дзеля запавету Свайго з
Абрагамам, Ісаакам і Якубам, і не хацеў выгубіць іх, і не адкінуў іх ад аблічча Свайго назаўсёды.
24 І памёр Хазаэль, валадар Сірыі, а замест яго стаў валадаром Бэн-Гадад, сын ягоны.
25 І павярнуўся Егааш, сын Егаахаза, і ўзяў з рук Бэн-Гадада, сына Хазаэля, гарады, якія той
быў забраў з рук Егаахаза, бацькі ягонага, вайною. Тройчы пабіў яго Егааш і вярнуў гарады
Ізраіля.

2 Вал 14

1 У другім годзе Егааша, сына Егаахаза, валадара Ізраіля, Амазія, сын Ёаша, стаў валадаром
Юды.
2 Меў ён дваццаць пяць гадоў, калі пачаў валадарыць, і дваццаць дзевяць гадоў быў валадаром
у Ерусаліме. Імя маці ягонай — Егааддан з Ерусаліму.
3 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, але ня так, як Давід, бацька ягоны, і рабіў ён усё так, як
Ёаш, бацька ягоны.
4 Толькі ўзгоркі не былі зьнішчаныя, і народ складаў ахвяры, і кадзіў на ўзгорках.
5 І калі ўмацаваў ён валадараньне сваё ў руцэ сваёй, ён забіў слугаў сваіх, якія забілі валадара,
бацьку ягонага.
6 Але сыноў іхніх не забіваў паводле таго, што напісана ў Кнізе Закону Майсея, як загадаў
ГОСПАД, кажучы: «Бацькі ня будуць забіваныя за сыноў, а сыны ня будуць забіваныя за
бацькоў, але кожны за грэх свой сьмерцю памрэ».
7 Ён пабіў дзесяць тысячаў Эдомцаў у Саляной Даліне і захапіў Сэлю ў бітве, і назваў імя яе
Ёктээль, і так ёсьць да сёньня.
8 Тады паслаў Амазія пасланцоў да Егааша, сына Егаахаза, сына Егу, валадара Ізраіля, кажучы:
«Прыйдзі і пабачым абліччы [адзін аднаго]!»
9 І паслаў Егааш, валадар Ізраіля, Амазіі, валадару Юды, кажучы: «Цярніна на Лібане паслала
да кедра на Лібане, кажучы: “Дай дачку сваю сыну майму за жонку”. Але прыйшлі зьвяры
палявыя, якія на Лібане, і вытапталі цярніну.
10 Ты пабіў Эдома, і сэрца тваё ўзганарылася. Будзь сабе слаўны, але заставайся ў доме тваім!
Навошта ты выклікаеш ліха, каб упаў ты і Юда з табою?»
11 Але Амазія не паслухаў. І выйшаў Егааш, валадар Ізраіля, і ён і Амазія, валадар Юды,
пабачылі абліччы [адзін аднаго] ў Бэт-Шэмэшы, які ў Юдзе.
12 І Юда быў пабіты Ізраілем, і ўцёк кожны ў намёт свой.
13 І Егааш, валадар Ізраіля, схапіў Амазію, валадара Юды, сына Ёаша, сына Ахазіі, у Бэт-
Шэмэшы, і завёў яго ў Ерусалім, і зрабіў вылом у муры Ерусаліму ад брамы Эфраіма аж да
брамы Вуглавой на чатырыста локцяў
14 і забраў усё золата і срэбра, і ўсе рэчы, якія знаходзіліся ў Доме ГОСПАДА і ў скарбніцах дому
валадара, і [ўзяў] закладнікаў, і вярнуўся ў Самарыю.
15 А іншыя дзеяньні Егааша, і мужнасьць ягоная, з якою ваяваў ён супраць Амазіі, валадара
Юды, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
16 І супачыў Егааш з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў Самарыі з валадарамі Ізраіля. І стаў
валадаром пасьля яго Ерабаам, сын ягоны.
17 А Амазія, сын Ёаша, валадар Юды, жыў яшчэ пятнаццаць гадоў пасьля сьмерці Егааша, сына
Егаахаза, валадара Ізраіля.
18 А іншыя дзеяньні Амазіі запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
19 І зрабілі супраць яго змову ў Ерусаліме, і ён уцёк у Ляхіш. І паслалі за ім у Ляхіш, і там забілі
яго.
20 І прывезьлі яго коньмі, і быў ён пахаваны ў Ерусаліме з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда.

21 А ўвесь народ Юды ўзяў Азарыю, які меў шаснаццаць гадоў, і паставілі яго валадаром на
месца Амазіі, бацькі ягонага.
22 Ён адбудаваў Элят і вярнуў яго Юдзе пасьля таго, як супачыў валадар [Амазія] з бацькамі
сваімі.
23 У пятнаццатым годзе Амазіі, сына Ёаша, валадара Юды, Ерабаам, сын Егааша, стаў
валадаром Ізраіля ў Самарыі на сорак адзін год.
24 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і не адвярнуўся ад усіх грахоў Ерабаама, сына Навата, які
ўвёў у грэх Ізраіля.
25 Ён вярнуў межы Ізраіля ад уваходу ў Хамат і аж да мора Арабы паводле слова ГОСПАДА, Бога
Ізраіля, якое Ён прамовіў праз слугу Свайго Ёну, сына Амітая, прарока, які быў з Гат-Гахэфэру.
26 Бо бачыў ГОСПАД горкую нядолю Ізраіля, бо не было ані нявольніка, ані вольнага, хто б
дапамог Ізраілю.
27 І не прамовіў ГОСПАД, каб выкараніць імя Ізраіля з-пад неба, і выратаваў яго рукою
Ерабаама, сына Егааша.
28 А іншыя дзеяньні Ерабаама, і мужнасьць ягоная, з якой ён ваяваў і з якою вярнуў Ізраілю
Дамаск і Хамат Юдэйскі, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
29 І супачыў Ерабаам з бацькамі сваімі, валадарамі Ізраіля, і стаў валадаром пасьля яго
Захарыя, сын ягоны.

2 Вал 15

1 У дваццаць сёмым годзе Ерабаама, валадара Ізраіля, Азарыя, сын Амазіі, стаў валадаром
Юды.
2 Меў ён шаснаццаць гадоў, калі стаў валадаром, і валадарыў у Ерусаліме пяцьдзясят два гады.
Імя маці ягонай — Ехолія з Ерусаліму.
3 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, усё, як рабіў Амазія, бацька ягоны.
4 Толькі ўзгоркі не былі зьнішчаныя, і народ складаў ахвяры, і кадзіў на ўзгорках.
5 І наведаў ГОСПАД валадара, і ён быў пракажоны аж да дня сьмерці сваёй, і жыў у доме
самотна, а Ёатам, сын валадара, быў над домам [валадара] і судзіў народ зямлі.
6 А іншыя дзеяньні Азарыі і ўсё, што ён рабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
7 І супачыў Азарыя з бацькамі сваімі, і пахавалі яго з бацькамі ягонымі ў горадзе Давіда. І стаў
валадаром пасьля яго Ёатам, сын ягоны.
8 У трыццаць восьмым годзе Азарыі, валадара Юды, Захарыя, сын Ерабаама, стаў валадаром
Ізраіля ў Самарыі на шэсьць месяцаў.
9 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, як рабілі бацькі ягоныя, і не адступіў ад грахоў Ерабаама,
сына Навата, які ўвёў у грэх Ізраіля.
10 І Шальлюм, сын Ябэша, змовіўся супраць яго, і напаў на яго ў Іблеаме, і забіў, і заваладарыў
на месцы ягоным.
11 А іншыя дзеяньні Захарыі запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
12 Бо такое [было] слова ГОСПАДА, якое Ён прамовіў да Егу, кажучы: «Сыны твае аж да
чацьвёртага пакаленьня будуць сядзець на пасадзе Ізраіля». І так сталася.
13 Шальлюм, сын Ябэша, стаў валадаром у трыццаць дзявятым годзе Узіі, валадара Юды, і
валадарыў адзін месяц у Самарыі.
14 І выйшаў Мэнахэм, сын Гадзі, з Тырцы, і прыйшоў у Самарыю, і напаў на Шальлюма, сына
Ябэша, у Самарыі, і забіў яго, і стаў валадаром замест яго.
15 А іншыя дзеяньні Шальлюма і змова ягоная, якую ён учыніў, запісаныя ў Кнізе летапісаў
валадароў Ізраіля.
16 І спустошыў Мэнахэм Тыфсах і ўсё, што ў ім было, і ваколіцы ягоныя, [пачынаючы] ад
Тырцы, бо [горад] не адчыніў яму [брамы]. І ён выбіў яго, і ўсіх цяжарных жанчынаў пасек.
17 У трыццаць дзявятым годзе Азарыі, валадара Юды, Мэнахэм, сын Гадзі, стаў валадаром
Ізраіля ў Самарыі на дзесяць гадоў.
18 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і не адступаў ад грахоў Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у
грэх Ізраіля, у-ва ўсе дні свае.

19 І прыйшоў Пул, валадар Асірыі, у зямлю Ізраіля. І Мэнахэм даў Пулу тысячу талентаў
срэбра, каб былі рукі ягоныя з ім і каб умацаваць валадарства ў руках сваіх.
20 І Мэнахэм гэтае срэбра разлажыў на Ізраільцянаў, на ўсіх людзей багатых, па пяцьдзясят
сыкляў срэбра на кожнага чалавека, каб аддаць валадару Асірыі. І валадар Асірыі вярнуўся
назад, і не застаўся ў зямлі Ізраіля.
21 А іншыя дзеяньні Мэнахэма і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў
Ізраіля.
22 І супачыў Мэнахэм з бацькамі сваімі, а пасьля яго стаў валадаром Пэкахія, сын ягоны.
23 У пяцідзясятым годзе Азарыі, валадара Юды, Пэкахія, сын Мэнахэма, стаў валадаром Ізраіля
ў Самарыі на два гады.
24 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і не адступаў ад грахоў Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у
грэх Ізраіля.
25 І змовіўся супраць яго Пэках, сын Рэмаліі, збраяносец ягоны, і забіў яго ў Самарыі ў вежы
дому валадара з Аргобам і Арыяй, і з ім пяцьдзясят сыноў Гілеаду. І ён забіў яго, і стаў
валадаром замест яго.
26 А іншыя дзеяньні Пэкахіі і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
27 У пяцьдзясят другім годзе Азарыі, валадара Юды, Пэках, сын Рэмаліі, стаў валадаром Ізраіля
ў Самарыі на дваццаць гадоў.
28 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і не адступаў ад грахоў Ерабаама, сына Навата, які ўвёў у
грэх Ізраіля.
29 У дні Пэкаха, валадара Ізраіля, прыйшоў Тыглят-Пілесэр, валадар Асірыі, і здабыў Абэль-
Бэт-Мааху, Янаах, Кэдэш, Хацор, Гілеад, Галілею і ўсю зямлю Нэфталі, і перасяліў іх у Асірыю.
30 А Осія, сын Элы, змовіўся супраць Пэкаха, сына Рэмаліі, і напаў на яго, і забіў яго, і стаў
валадаром замест яго ў дваццатым годзе Ётама, сына Узіі.
31 А іншыя дзеяньні Пэкаха і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Ізраіля.
32 У другім годзе Пэкаха, сына Рэмаліі, валадара Ізраіля, стаў валадаром Ётам, сын Узіі,
валадара Юды.
33 Меў ён дваццаць пяць гадоў, калі стаў валадаром, і шаснаццаць гадоў валадарыў у Ерусаліме.
Імя маці ягонай — Еруша, дачка Цадока.
34 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА; паводле ўсяго, што рабіў Узія, бацька ягоны, ён рабіў.
35 Толькі ўзгоркі не былі зьнішчаныя, і народ складаў ахвяры, і кадзіў на ўзгорках. І пабудаваў
ён верхнюю браму Дому ГОСПАДА.
36 А іншыя дзеяньні Ётама і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
37 У дні ягоныя ГОСПАД пачаў пасылаць на Юду Рэцына, валадара Сірыі, і Пэкаха, сына Рэмаліі.
38 І супачыў Ётам з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда, бацькі
свайго. І стаў валадаром пасьля яго Ахаз, сын ягоны.

2 Вал 16

1 У сямнаццатым годзе Пэкаха, сына Рэмаліі, Ахаз, сын Ётама, стаў валадаром Юды.
2 Ахаз меў дваццаць гадоў, калі стаў валадаром, і шаснаццаць гадоў валадарыў у Ерусаліме. І
не рабіў ён слушнага ў вачах ГОСПАДА, Бога ягонага, як Давід, бацька ягоны.
3 І хадзіў ён шляхам валадароў Ізраіля, і нават сына свайго правёў праз агонь паводле брыдотаў
народаў, якіх ГОСПАД выгнаў перад абліччам сыноў Ізраіля.
4 І складаў ён ахвяры, і кадзіў на ўзгорках, на ўзвышшах, і пад кожным дрэвам зялёным.
5 Тады Рэцын, валадар Сірыі, і Пэках, сын Рэмаліі, валадар Ізраіля, пайшлі ваяваць супраць
Ерусаліму. І абляглі яны Ахаза, але не змаглі перамагчы яго.
6 У той час Рэцын, валадар Сірыі, далучыў Элят да Сірыі і выгнаў Юдэяў з Эляту. І прыйшлі
Эдомцы ў Элят, і абжыліся там да сёньняшняга дня.
7 І паслаў Ахаз пасланцоў да Тыглят-Пілесэра, валадара Асірыі, кажучы: «Я — слуга твой і сын
твой. Прыйдзі і выратуй мяне з рукі валадара Сірыі і з рукі валадара Ізраіля, якія паўсталі на
мяне».

8 І ўзяў Ахаз срэбра і золата, якое знаходзілася ў Доме ГОСПАДА і ў скарбніцы дому валадара,
і паслаў як дар валадару Асірыі.
9 І паслухаў яго валадар Асірыі, і прыйшоў валадар Асірыі ў Дамаск, і здабыў яго, і перасяліў
яго ў Кір, і Рэцына забіў.
10 І пайшоў валадар Ахаз на спатканьне з Тыглят-Пілесэрам, валадаром Асірыі, у Дамаск, і
ўбачыў ахвярнік у Дамаску. І валадар Ахаз пераслаў Урыі сьвятару выяву ахвярніка і ўзор
усёй пабудовы ягонай.
11 І пабудаваў Урыя сьвятар ахвярнік паводле ўсяго таго, што прыслаў валадар Ахаз з Дамаску,
і зрабіў гэта сьвятар Урыя, пакуль вярнуўся валадар Ахаз з Дамаску.
12 І прыйшоў валадар з Дамаску, і ўбачыў ахвярнік, і наблізіўся валадар да ахвярніка, і
ўзыйшоў на яго.
13 І спаліў ён цэласпаленьне сваё і ахвяру хлебную сваю, і выліў ахвяру вадкую сваю, і крывёю
ахвяраў мірных сваіх пакрапіў ахвярнік.
14 А мядзяны ахвярнік, які [стаяў] перад абліччам ГОСПАДА, ён загадаў прыбраць з пярэдняга
боку Дому [Божага], паміж ахвярнікам і Домам ГОСПАДА, і паставіў яго побач ахвярніка
[новага] на поўначы.
15 загадаў валадар Ахаз сьвятару Урыі, кажучы: «На вялікім ахвярніку палі ранішняе
цэласпаленьне і ахвяру хлебную вячэрнюю, цэласпаленьні валадара і ягоную ахвяру хлебную,
цэласпаленьні ўсяго народу зямлі, ягоныя ахвяры хлебныя і ахвяры вадкія. І вылівай на
яго ўсю кроў ахвяраў цэласпаленьня і кроў ахвяраў крывавых. А ахвярнік мядзяны будзе ў
распараджэньні маім».
16 І святар Урыя зрабіў усё, што яму загадаў валадар Ахаз.
17 І валадар Ахаз абламіў ліштвы з падставаў, і зьняў з іх мыцельнікі, і зьняў мора з валоў
мядзяных, якія пад ім былі, і паставіў яго на каменную падлогу.
18 І ён прыбраў перад абліччам валадара Асірыі кружганак суботні, які пабудавалі ў Доме
[Божым], і выхад навонкі для валадара з Дому ГОСПАДА.
19 А іншыя дзеяньні Ахаза, якія ён рабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
20 І супачыў Ахаз з бацькамі сваімі і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда. І пасьля
яго стаў валадаром Эзэкія, сын ягоны.

2 Вал 17

1 У дванаццатым годзе Ахаза, валадара Юды, Осія, сын Элы, стаў валадаром Ізраіля ў Самарыі
на дзевяць гадоў.
2 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, але ня так, як валадары Ізраіля, якія былі перад ім.
3 Выйшаў супраць яго Сальманэсэр, валадар Асірыі. І Осія стаў слугою ягоным, і плаціў яму
даніну.
4 Але валадар Асірыі выкрыў змову Осіі, бо ён паслаў пасланцоў да Со, валадара Эгіпту, і не
прынёс даніну валадару Асірыі, як кожны год [рабіў]. І ўзяў яго валадар Асірыі, і замкнуў у
вязьніцы.
5 І пайшоў валадар Асірыі на ўсю зямлю, і прыйшоў да Самарыі, і аблягаў яе тры гады.
6 У дзявятым годзе Осіі валадар Асірыі здабыў Самарыю і перасяліў Ізраіля ў Асірыю, і пасяліў
іх у Халаху, і ў Хаборы каля ракі Газан, і ў гарадах Мідзянаў.
7 І сталася гэта, бо сыны Ізраіля грашылі супраць ГОСПАДА, Бога свайго, Які вывеў іх з зямлі
Эгіпецкай, з рукі фараона, валадара Эгіпту, і баяліся багоў чужых,
8 і хадзілі паводле звычаю народаў, якіх выгнаў ГОСПАД перад абліччам сыноў Ізраіля, і
паводле звычаю валадароў Ізраіля, якія рабілі [брыдоты].
9 І зьневажалі сыны Ізраіля ўчынкамі ліхімі ГОСПАДА, Бога свайго, і будавалі сабе ўзгоркі ў-ва
ўсіх гарадах сваіх, ад вартавой вежы аж да ўмацаванага гораду.
10 І паставілі яны сабе слупы і Астартаў на кожным узгорку высокім і пад кожным дрэвам
зялёным.
11 І кадзілі яны там на ўсіх узгорках, як народы, якіх ГОСПАД выгнаў перад абліччам іхнім, і
рабілі рэчы ліхія, і гнявілі ГОСПАДА,

12 і служылі ідалам, пра якіх ГОСПАД гаварыў ім, каб не рабілі гэтага.
13 І сьведчыў ГОСПАД супраць Ізраіля і супраць Юды праз усіх прарокаў Сваіх і ўсіх відушчых,
кажучы: «Зьвярніце са шляхоў сваіх ліхіх і захоўвайце прыказаньні Мае і пастановы Мае
паводле ўсяго Закону, які Я даў бацькам вашым і які пасылаў вам праз слугаў Маіх, прарокаў».
14 Але яны ня слухалі і цьвёрдым зрабілі карак свой, як карак бацькоў іхніх, якія не хацелі
верыць ГОСПАДУ, Богу свайму.
15 І адкінулі яны пастановы Ягоныя і запавет Ягоны, які Ён заключыў з бацькамі іхнімі, і
сьведчаньне Ягонае, якім Ён сьведчыў ім, і ішлі за марнасьцямі і гідотаю, і ўсьлед за народамі,
якія навокал іх, пра якіх загадаў ім ГОСПАД, каб не рабілі так, як яны.
16 І занядбалі яны ўсе прыказаньні ГОСПАДА, Бога свайго, і зрабілі сабе літыя выявы, і двух
быкоў, і Астарту, і пакланяліся ўсяму войску нябеснаму, і служылі Баалу,
17 і праводзілі сыноў сваіх і дачок сваіх праз агонь, і займаліся варажбою і чараваньнем, і
прадаваліся, каб рабіць ліхоту ў вачах ГОСПАДА, і гнявілі Яго.
18 І моцна загневаўся ГОСПАД на Ізраіля, і адкінуў іх ад аблічча Свайго, і нікога не засталося,
толькі адно калена Юды.
19 Але Юда таксама не захоўваў прыказаньняў ГОСПАДА, Бога свайго, і хадзіў паводле звычаяў
Ізраільцянаў, як яны рабілі.
20 І ГОСПАД адкінуў усё насеньне Ізраіля, і прынізіў іх, і аддаў іх у рукі рабаўнікоў, аж пакуль
зусім не адкінуў іх ад аблічча Свайго.
21 Бо Ізраіль аддзяліўся ад дому Давіда і зрабіў сабе валадаром Ерабаама, сына Навата, а
Ерабаам адарваў Ізраіля ад ГОСПАДА і ўвёў іх у грэх вялікі.
22 І сыны Ізраіля хадзілі ў-ва ўсіх грахах Ерабаама, якія ён учыняў, і не пакідалі іх,
23 аж пакуль ГОСПАД не адкінуў Ізраіля ад аблічча Свайго, як прамовіў праз усіх слугаў Сваіх,
прарокаў. І перасяліў Ён Ізраіля з зямлі іхняй у Асірыю аж да гэтага дня.
24 І валадар Асірыі перасяліў [людзей] з Бабілону, з Куты, з Аввы, з Хамату і з Сэфарваіму, і
пасяліў іх у гарадах Самарыі замест сыноў Ізраіля. І яны прыйшлі ў Самарыю, і абжыліся ў
ваколіцах ейных.
25 І сталася, калі яны там спачатку абжыліся, яны не баяліся ГОСПАДА. І ГОСПАД спаслаў на іх
ільвоў, і яны забівалі іх.
26 І сказалі валадару Асірыі, кажучы: «Народы, якія ты перасяліў і пасяліў у гарадах Самарыі,
ня ведаюць прысудаў Бога зямлі той, і Ён спслаў на іх ільвоў, і вось, яны забіваюць іх, бо яны
ня ведаюць прысудаў Бога зямлі той».
27 І загадаў валадар Асірыі, кажучы: «Завядзіце туды аднаго са сьвятароў, якога адтуль забралі
ў няволю. Няхай ён ідзе і жыве там, і няхай навучыць іх прысудам Бога зямлі той».
28 І пайшоў адзін са сьвятароў, якога забралі ў няволю з Самарыі, і абжыўся ў Бэтэлі, і вучыў
іх, як яны маюць баяцца ГОСПАДА.
29 І сталася, што кожны народ зрабіў сабе бога свайго, і ставілі іх у сьвятынях на ўзгорках, якія
раней пабудавалі Самаране; кожны народ у мясцовасьцях сваіх, дзе жыў.
30 Так людзі з Бабілону зрабілі Сукот-Бэнота, а людзі з Куты зрабілі Нэргаля, а людзі з Хамату
— Ашыму,
31 а [жыхары] Аввы зрабілі Нібхаза і Тартака; Сэфарваімцы палілі ў агні дзяцей сваіх на
[ўшанаваньне] Адрамэлеха і Анамэлеха, багоў Сэфарваіму.
32 І таксама яны баяліся ГОСПАДА, і спаміж сябе яны паставілі сьвятароў узгоркаў, і складалі
ахвяры ў сьвятынях на ўзгорках.
33 І яны баяліся ГОСПАДА, і служылі багам сваім паводле звычаю тых народаў, з якіх яны былі
пераселеныя.
34 Аж да сёньняшняга дня яны робяць паводле старых звычаях, і не баяцца ГОСПАДА, не
выконваюць пастановаў Ягоных і прысудаў Ягоных, Закону і прыказаньняў, якія загадаў
ГОСПАД сынам Якуба, якому даў імя Ізраіль.
35 І заключыў ГОСПАД з імі запавет, і загадаў ім, кажучы: «Ня бойцеся багоў чужых, і не
пакланяйцеся ім, і не служыце ім, і не складайце ахвяраў ім.

36 Толькі ГОСПАДА, Які вывеў вас з зямлі Эгіпецкай сілай вялікаю і рамяном узьнятым, Яго
бойцеся, Яму пакланяйцеся і Яму ахвяры складайце.
37 І пастановы, прысуды, Закон і прыказаньні, якія Ён напісаў вам, захоўвайце, каб выконваць
іх у-ва ўсе дні, а багоў чужых ня бойцеся.
38 І не забывайцеся пра запавет, які Я заключыў з вамі, і ня бойцеся багоў чужых.
39 Толькі ГОСПАДА, Бога вашага, бойцеся, і Ён выратуе вас з рук усіх ворагаў вашых».
40 Але яны не паслухалі, а рабілі ўсё паводле даўнейшых звычаяў сваіх.
41 І сталася, што гэтыя народы баяліся ГОСПАДА і служылі багам сваім. І таксама сыны іхнія,
і сыны сыноў іхніх робяць так, як рабілі бацькі іхнія, аж да сёньняшняга дня.

2 Вал 18

1 І сталася ў трэцім годзе Осіі, сына Элы, валадара Ізраіля, Эзэкія, сын Ахаза, стаў валадаром
Юды.
2 Меў ён дваццаць пяць гадоў, калі стаў валадаром, і валадарыў дваццаць дзевяць гадоў у
Ерусаліме. Імя маці ягонай — Абія, дачка Захарыі.
3 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, паводле ўсяго, што рабіў Давід, бацька ягоны.
4 Ён зьнішчыў узгоркі, паламіў слупы, пасьсякаў Астартаў і скрышыў зьмея мядзянага, якога
зрабіў Майсей, бо аж да гэтага часу сыны Ізраіля кадзілі яму і называлі яго Нэхуштан.
5 І ён спадзяваўся на ГОСПАДА, Бога Ізраіля, і пасьля яго не было падобнага да яго між усіх
валадароў Юды, і перад ім не было такога.
6 І ён прыляпіўся да ГОСПАДА, і не адступаўся ад Яго, і захоўваў прыказаньні Ягоныя, якія
загадаў ГОСПАД Майсею.
7 І ГОСПАД быў з ім, і ў-ва ўсім, што рабіў, ён меў посьпех. І збунтаваўся ён супраць валадара
Асірыі, і не служыў яму.
8 Ён пабіў Філістынцаў аж да Газы і яе ваколіцаў, ад вартавой вежы аж да ўмацаванага гораду.
9 І сталася ў чацьвёртым годзе валадара Эзэкіі, які быў сёмым годам Осіі, сына Элы, валадара
Ізраіля, вырушыў Сальманэсэр, валадар Асірыі, супраць Самарыі і аблёг яе.
10 І здабыў ён яе праз тры гады. У шостым годзе Эзэкіі, які быў дзявятым годам Осіі, валадара
Ізраіля, была здабытая Самарыя.
11 І валадар Асірыі перасяліў Ізраіля ў Асірыю, і пасяліў іх у Халаху, у Хаборы каля ракі Газан
і ў гарадах Мідзянаў,
12 бо ня слухалі яны голасу ГОСПАДА, Бога свайго, і парушалі запавет Ягоны, і ўсё, што загадаў
Майсей, слуга ГОСПАДА, ня слухалі і не выконвалі.
13 У чатырнаццатым годзе валадара Эзэкіі прыйшоў Санхэрыў, валадар Асірыі, на ўсе
ўмацаваныя гарады Юды і захапіў іх.
14 І паслаў Эзэкія, валадар Юды, да валадара Асірыі ў Ляхіш, кажучы: «Саграшыў я. Адыйдзі
ад мяне. Што накладзеш на мяне, панясу». І валадар Асірыі наклаў на Эзэкію, валадара Юды,
[даніну] ў трыста талентаў срэбра і трыццаць талентаў золата.
15 І аддаў Эзэкія ўсё срэбра, якое знаходзілася ў Доме ГОСПАДА і ў скарбніцах дому валадара.
16 У той час Эзэкія зьняў [золата] з дзьвярэй Дому ГОСПАДА і з вушакоў, якія пазалаціў Осія,
валадар Юды, і аддаў яго валадару Асірыі.
17 І паслаў валадар Асірыі з Ляхіша начальніка войска і галоўнага эўнуха, і Рабсака да валадара
Эзэкіі ў Ерусалім з вялікім войскам. І яны пайшлі, і прыйшлі ў Ерусалім, і пайшлі, і прыйшлі,
і сталі каля каналу верхняе сажалкі, якая на дарозе Поля Валюшніка.
18 І паклікалі яны валадара. І выйшлі да іх Эліякім, сын Хількіі, загадчык дому [валадара], і
Шэўна пісар, і Ёах, сын Асафа, канцлер.
19 І сказаў ім Рабсак: «Скажыце Эзэкіі: “Гэта кажа вялікі валадар, валадар Асірыі. Што гэта за
надзея, на якую ты спадзяешся?
20 Ці ты думаеш, што словы заменяць раду і сілу да бою? На каго ты спадзяешся, што
збунтаваўся супраць мяне?

21 Ці ты спадзяешся на Эгіпет, на гэты надламаны кій з трысьнёгу, які, калі хто абапрэцца
на яго, уваходзіць у далонь і прабівае яе. Такі фараон, валадар Эгіпецкі, для ўсіх, хто на яго
спадзяецца.
22 А можа скажаце мне: "На ГОСПАДА, Бога нашага, спадзяемся"? Дык ці ж Ён ня Той, Якога
ўзгоркі і ахвярнікі панішчыў Эзэкія і сказаў Юдзе і Ерусаліму: "Толькі перад ахвярнікам у
Ерусаліме будзеце пакланяцца ГОСПАДУ"?"
23 І цяпер пайдзі ў заклад з гаспадаром маім, валадаром Асірыі, і я дам табе дзьве тысячы
коней, калі зможаш дастаць сабе вершнікаў для іх.
24 І якім чынам ты выганіш аднаго намесьніка з найменшых слугаў гаспадара майго? Ці ты
спадзяешся на Эгіпет дзеля калясьніцаў і коньнікаў?
25 Ці не бяз [волі] ГОСПАДА прыйшоў я на гэтае месца, каб яго спустошыць? ГОСПАД сказаў
мне: "Ідзі ў зямлю гэтую і спустош яе"».
26 І сказалі Эліякім, сын Хількіі, і Шэўна, і Ёах Рабсаку: «Гавары, калі ласка, да слугаў тваіх
па-арамейску, бо мы разумеем мову гэтую, а не гавары да нас па-гебрайску, у вушы народу,
які на мурах».
27 І адказаў ім Рабсак: «Ці ж [толькі] да гаспадара твайго і да цябе паслаў мяне гаспадар мой,
каб я казаў словы гэтыя? Хіба не паслаў ён мяне да людзей, якія сядзяць на мурах і мусяць
есьці лайно сваё і піць ваду ног сваіх з вамі?»
28 І стаў Рабсак, і закрычаў моцным голасам па-гебрайску, і прамовіў, і сказаў: «Слухайце
словы валадара вялікага, валадара Асірыі.
29 Гэта кажа валадар. Няхай вас не падманвае Эзэкія, бо ня зможа ён выратаваць вас з рукі
маёй!
30 І няхай не падманвае вас Эзэкія надзеяй на ГОСПАДА, кажучы: "Выратоўваючы, выратуе нас
ГОСПАД і не аддасьць горад гэты ў рукі валадара Асірыі".
31 Ня слухайце Эзэкіі, бо гэта кажа валадар Асірыі: "Зрабіце [дамову] дабраславенства са мною
і выходзьце да мяне, і будзеце есьці з вінаградніку вашага і з дрэва фігавага вашага, і будзеце
піць ваду з сажалак вашых,
32 пакуль я не прыйду і не перасялю вас у зямлю, падобную да зямлі вашай, у зямлю збожжа і
віна, зямлю хлеба і вінаграду, зямлю аліўкаў і мёду. І вы будзеце там жыць і не памраце". Дык
ня слухайце Эзэкіі, які вас падманвае, кажучы: "ГОСПАД выратуе нас!"
33 Ці выратавалі богі народаў, кожны зямлю сваю, ад рукі валадара Асірыі?
34 Дзе богі Хамату і Арпаду? Дзе богі Сэфарваіму, Гэны і Іввы? Ці выратавалі яны Самарыю з
рукі маёй?
35 Хто з усіх багоў земляў гэтых выратаваў зямлю сваю ад рукі маёй? Няўжо ГОСПАД выратуе
з рукі маёй Ерусалім?»
36 А народ маўчаў і не адказваў яму ані слова, бо такі быў загад валадара, які казаў: «Не
адказвайце».
37 І прыйшлі Эліякім, сын Хількіі, загадчык дому [валадара], і Шэўна пісар, і Ёах, сын Асафа,
канцлер, да Эзэкіі ў разьдзёртых шатах, і паведамілі яму словы Рабсака.

2 Вал 19

1 І сталася, калі пачуў [гэта] валадар Эзэкія, ён разьдзёр шаты свае, і апрануўся ў зрэбніцу, і
пайшоў у Дом ГОСПАДА.
2 І паслаў ён Эліякіма, загадчыка дому [валадара], і Шэўну пісара, і старэйшых сьвятароў,
апранутых у зрэбніцу, да прарока Ісаі, сына Амоса.
3 І сказалі яны яму: «Гэта кажа Эзэкія: "Гэты дзень — дзень прыгнёту, кары і ганьбы! Бо дайшлі
сыны да ўлоньня, але няма сілы іх нарадзіць!
4 Можа, пачуе ГОСПАД, Бог твой, усе словы Рабсака, якога паслаў гаспадар ягоны, валадар
Асірыі, каб зьневажаць Бога Жывога, і пакарае яго за словы, якія пачуў ГОСПАД, Бог твой! Дык
узьнясі малітву за рэшту, якая засталася"».
5 І прыйшлі слугі валадара Эзэкіі да Ісаі.

6 І сказаў ім Ісая: «Так скажыце гаспадару вашаму: “Гэта кажа ГОСПАД. Ня бойся словаў, якія ты чуў, якімі слугі валадара Асірыі зьневажалі Мяне!
7 Вось, Я пашлю яму духа, і ён пачуе вестку, і вернецца ў зямлю сваю, і Я ўдару яго мячом у зямлі ягонай”».
8 І вярнуўся Рабсак, і знайшоў валадара Асірыі, які здабываў Лібну, бо пачуў, што ён адыйшоў з-пад Ляхішу.
9 І пачуў ён пра Тыргака, валадара Кушу: «Вось, ён пайшоў на вайну супраць цябе», і вярнуўся, і паслаў пасланцоў да Эзэкіі, кажучы:
10 «Гэтак скажыце Эзэкіі, валадару Юды, кажучы: “Няхай ня зводзіць цябе Бог твой, на Якога ты спадзяешся, кажучы: "Ня будзе аддадзены Ерусалім у рукі валадара Асірыі".
11 Вось, ты чуў, што зрабілі валадары Асірыі з усімі землямі, як яны панішчылі іх. А ты мог бы выратавацца?
12 Ці ж богі тых народаў, якіх зьнішчылі бацькі мае, выратавалі іх? Дзе Газан, Харан, Рэзэф і сыны Эдэну, якія ў Тэлясары?
13 Дзе валадар Хамату і валадар Арпаду, валадары гарадоў Сэфарваіму, Гэны і Іввы?”»
14 І ўзяў Эзэкія лісты з рук пасланцоў, і прачытаў іх, і пайшоў у Дом ГОСПАДА, і разгарнуў іх перад абліччам ГОСПАДА.
15 І маліўся Эзэкія перад абліччам ГОСПАДА, і сказаў: «ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, Які сядзіш на херувімах! Толькі Ты — Бог усіх валадарстваў зямлі. Ты ўчыніў неба і зямлю.
16 Нахіні, ГОСПАДЗЕ, вуха Тваё і пачуй; адкрый, ГОСПАДЗЕ, вочы Твае і пабач! І пачуй усе словы Санхэрыва, які паслаў іх, каб зьневажаць Бога Жывога.
17 Гэта праўда, ГОСПАДЗЕ, што валадары Асірыі зьнішчылі народы і землі іхнія.
18 І яны кінулі ў агонь багоў іхніх, бо яны ня богі, але толькі творы рук чалавечых з дрэва і камяня, і яны зьнішчылі іх.
19 А цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа наш, збаў нас, прашу, ад рукі ягонай, і няхай ведаюць усе валадарствы зямлі, што Ты, ГОСПАДЗЕ, — Бог, толькі Ты».
20 І паслаў Ісая, сын Амоса, да Эзэкіі, кажучы: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я пачуў тое, пра што ты маліўся да Мяне адносна Санхэрыва, валадара Асірыі”.
21 Гэта слова, якое прамовіў ГОСПАД пра яго: “Насьміхаецца з цябе, пагарджае табою дзяўчына, дачка Сыёну; за табой ківае галавой дачка Ерусаліму.
22 Каго зьневажаў ты і на Каго плявузгаў? Супраць Каго падняў ты голас твой і высока ўзьняў вочы твае? Супраць Сьвятога Ізраілевага!
23 Праз пасланцоў тваіх ты зьневажаў Госпада і казаў: "З мноствам калясьніцаў маіх я ўзыйшоў на горы высокія, на схілы Лібану. Я выразаў гонкія кедры і найпрыгажэйшыя кіпарысы, і дайшоў аж у нетры лесу Кармэлю.
24 Я выкапаў [студню] і п’ю воды чужыя, і стопамі ног маіх я высушыў усе рэкі Эгіпецкія".
25 Ці ты ня чуў, што Я даўно зрабіў гэта, у дні старадаўнія? Я гэта прызначыў, а цяпер зьдзяйсьняю, і стануць купай друзу гарады ўмацаваныя.
26 А тыя, што жывуць у іх, [маюць] слабыя рукі, стрывожаныя і зьбянтэжаныя, і сталіся як сена ў полі, як зеляніна маладая, як трава на даху, спаленая перш, чым сасьпела.
27 Ці ты сядзіш, ці выходзіш, ці ўваходзіш — Я ведаю, і [ведаю] злоснасьць тваю адносна Мяне.
28 За тое, што ты злуешся на Мяне і што пыха твая дайшла да вушэй Маіх, Я ўкладу ў ноздры твае колца Маё і цуглі Мае ў вусны твае, і выведу цябе на дарогу, па якой ты прыйшоў!”
29 А для цябе, [Эзэкія], будзе знак: у гэтым годзе еш тое, што засталося ад сабранага [зерня], а ў другі год — тое, што само вырасьце, а ў трэці год сейце і зьбірайце, і саджайце вінаграднікі, і ешце плады іхнія.
30 І тое, што застанецца з дому Юды, пусьціць корань углыб, і дасьць плод угару.
31 Бо з Ерусаліму выйдзе рэшта, і збаўленыя — з гары Сыён. Рэўнасьць ГОСПАДА Магуцьцяў зробіць гэта!
32 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра валадара Асірыі: “Ня ўвойдзе ён у горад гэты, і ня выпусьціць у яго стралы, і не наставіць супраць яго шчыт, і не насыпе кругом яго валу.

33 Шляхам, якім ён прыйшоў, вернецца, і ў горад гэты ня ўвойдзе, кажа ГОСПАД.
34 Я абараню горад гэты і выратую яго дзеля Сябе і дзеля Давіда, слугі Майго”».
35 І сталася, што ў тую самую ноч выйшаў анёл ГОСПАДА і забіў у табары Асірыйцаў сто восемдзясят пяць тысячаў [чалавек]. І ўсталі раніцаю, і вось, усе яны мёртвыя.
36 І Санхэрыў, валадар Асірыі, сабраў [табар], і адыйшоў, і вярнуўся, і затрымаўся ў Ніневе.
37 І сталася, калі ён пакланяўся ў доме Нісроха, бога свайго, Адрамэлех і Шарэцэр, сыны ягоныя, забілі яго мячом і ўцяклі ў зямлю Арарат. І заваладарыў замест яго Эсар-Хадон, сын ягоны.

2 Вал 20

1 У тыя дні Эзэкія захварэў сьмяротна. І прыйшоў да яго прарок Ісая, сын Амоса, і сказаў яму: «Гэта кажа ГОСПАД: “Дай загад пра дом свой, бо ты памрэш і ня будзеш жыць”».
2 І Эзэкія адвярнуў аблічча сваё да сьцяны, і маліўся да ГОСПАДА, кажучы:
3 «О, ГОСПАДЗЕ! Узгадай, што я хадзіў перад абліччам Тваім у праўдзе і са шчырым сэрцам, і рабіў тое, што добрае ў вачах Тваіх». І плакаў Эзэкія плачам вялікім.
4 І яшчэ ня выйшаў Ісая з унутранага панадворку, як было да яго слова ГОСПАДА, кажучы:
5 «Вярніся і скажы Эзэкіі, правадыру народу Майго: “Гэта кажа ГОСПАД, Бог Давіда, бацькі твайго. Я пачуў малітву тваю і ўбачыў сьлёзы твае. Вось, Я аздараўлю цябе, і на трэці дзень ты ўвойдзеш у Дом ГОСПАДА.
6 І Я дадам да дзён тваіх пятнаццаць гадоў, і выратую з рукі валадара Асірыі цябе і горад гэты, і Я абараню горад гэты дзеля Сябе і дзеля Давіда, слугі Майго”».
7 І сказаў Ісая: «Вазьміце аладку з фігаў». І ўзялі яе, і палажылі на скулу, і [Эзэкія] ачуняў.
8 І сказаў Эзэкія Ісаі: «Які знак [будзе], што ГОСПАД аздаровіць мяне і што на трэці дзень я ўвайду ў Дом ГОСПАДА?»
9 І сказаў Ісая: «Гэта будзе табе знак ад ГОСПАДА, што ГОСПАД выканае слова, якое Ён прамовіў. Ці цень [сонечны на гадзіньніку Ахаза] мае прайсьці наперад на дзесяць прыступак, ці перайсьці назад на дзесяць прыступак?»
10 І сказаў Эзэкія: «Лёгка для ценю прайсьці наперад на дзесяць прыступак. Не, але няхай цень вернецца назад на дзесяць прыступак».
11 І клікаў прарок Ісая да ГОСПАДА, і Ён перасунуў цень на прыступках [гадзіньніка] Ахаза на дзесяць прыступак назад.
12 У той час Бэрадах-Баладан, сын Баладана, валадара Бабілону, паслаў лісты і падарункі Эзэкіі, бо ён пачуў, што Эзэкія быў хворы.
13 І ўсьцешыўся з іх Эзэкія, і паказаў ім увесь дом скарбаў сваіх, срэбра і золата, пахошчы каштоўны алей, збраёўню сваю і ўсё, што знаходзілася ў сховішчах ягоных. Не засталося рэчы, якой бы не паказаў ім Эзэкія ў доме сваім і ў-ва ўсёй дзяржаве сваёй.
14 І прыйшоў да валадара Эзэкіі прарок Ісая, і сказаў яму: «Што сказалі тыя людзі і адкуль яны прыйшлі да цябе?» Эзэкія сказаў яму: «З зямлі далёкай яны прыйшлі, з Бабілону».
15 І сказаў [Ісая]: «Што бачылі яны ў доме тваім?» І сказаў Эзэкія: «Усё, што ёсьць у доме маім, яны бачылі. Не было рэчы, якой я не паказаў бы ім у сховішчах маіх».
16 І сказаў Ісая Эзэкіі: «Паслухай слова ГОСПАДА.
17 Вось, прыйдуць дні, і ўсё, што ў доме тваім і што назьбіралі бацькі твае аж да гэтага дня, будзе забранае ў Бабілон, і не застанецца нічога, кажа ГОСПАД.
18 І сыноў тваіх, якія выйдуць з цябе, якіх ты народзіш, забяруць, і будуць яны эўнухамі ў палацы валадара Бабілону».
19 І сказаў Эзэкія Ісаі: «Добрае слова ГОСПАДА, якое ты прамовіў». І сказаў: «Будзе супакой і праўда ў дні мае».
20 А іншыя дзеяньні Эзэкіі, і мужнасьць ягоная, і як ён зрабіў сажалку і канал і ўвёў ваду ў горад, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
21 І супачыў Эзэкія з бацькамі сваімі, і пасьля яго заваладарыў Манаса, сын ягоны.

2 Вал 21

1 Манаса меў дванаццаць гадоў, калі стаў валадаром, і пяцьдзясят пяць гадоў ён валадарыў у
Ерусаліме. Імя маці ягонай — Хефцыба.
2 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА паводле агідаў народаў, якіх выгнаў ГОСПАД перад
абліччам сыноў Ізраіля.
3 І ён вярнуў і адбудаваў узгоркі, якія быў зьнішчыў Эзэкія, бацька ягоны, і пабудаваў ахвярнікі
Баалу, і зрабіў Астарту, якую быў зрабіўшы Ахаў, валадар Ізраіля, і пакланяўся ўсяму войску
нябеснаму, і служыў яму.
4 І пабудаваў ён ахвярнікі ў доме ГОСПАДА, пра які сказаў ГОСПАД: «У Ерусаліме Я зьмяшчу
імя Маё».
5 І пабудаваў ён ахвярнікі ўсяму войску нябеснаму на абодвух панадворках Дому ГОСПАДА.
6 І правёў ён сына свайго праз агонь, і займаўся варажбой і чараваньнямі, і паставіў тых, што
выклікаюць духаў памерлых, і варажбітоў, і шмат рабіў ён зла ў вачах ГОСПАДА, каб гнявіць
Яго.
7 І паставіў ён выяву Астарты, якую зрабіў, у Доме [Божым], пра які ГОСПАД сказаў Давіду і
Салямону, сыну ягонаму: «У гэтым Доме і ў Ерусаліме, які Я выбраў з усіх каленаў Ізраіля, Я
зьмяшчу імя Маё на вякі.
8 І ўжо больш ня будзе нага Ізраіля блукаць далёка ад зямлі, якую Я даў бацькам іхнім, калі
толькі будуць яны выконваць усё тое, што Я загадаў ім, іўвесь Закон, які даў ім Майсей, слуга
Мой».
9 Але яны ня слухалі Яго, і зьвёў іх Манаса, каб рабілі горш, чым народы, якія вынішчыў
ГОСПАД перад абліччам сыноў Ізраіля.
10 І прамаўляў ГОСПАД праз слугаў Сваіх, прарокаў, кажучы:
11 «За тое, што Манаса, валадар Юды, робіць брыдоты, горшыя, чым усё, яшто рабілі Амарэйцы
перад ім, і ўвёў у грэх нават Юду ідаламі сваімі,
12 дзеля гэтага так кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Я навяду ліха на Ерусалім і Юду, што ў кожнага,
хто пачуе [пра гэта], зазьвініць у абодвух вушах ягоных.
13 І Я працягну над Ерусалімам [меральны] шнур Самарыі і грунтвагу дому Ахава, і вытру
Ерусалім, як выціраецца міска, вытру і перавярну дагары дном.
14 І Я адкіну рэшту спадчыны Маёй, і аддам іх у рукі ворагаў іхніх, і стануцца яны рабункам і
здабычай усіх ворагаў іхніх.
15 За тое, што яны рабілі ліхоту ў вачах Маіх і гнявілі Мяне з таго дня, як выйшлі бацькі іхнія з
Эгіпту, аж па гэты дзень”».
16 Таксама Манаса праліваў вельмі шмат крыві нявіннай, аж напоўніў ёю Ерусалім ад краю да
краю, ня лічачы грахоў, у якія ўвёў Юду, робячы ліхоту ў вачах ГОСПАДА.
17 А іншыя дзеяньні Манасы, і ўсё, што ён зрабіў, і грахі ягоныя, якімі грашыў, запісаныя ў
Кнізе летапісаў валадароў Юды.
18 І супачыў Манаса з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў садзе дому свайго, у садзе Узіі. І стаў
валадаром пасьля яго Амон, сын ягоны.
19 Амон меў дваццаць два гады, калі стаў валадаром, і валадарыў ён у Ерусаліме два гады. Імя
маці ягонай — Мэшулемэт, дачка Харуца з Ётбы.
20 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, як Манаса, бацька ягоны,
21 і хадзіў усімі шляхамі, якімі хадзіў бацька ягоны, і служыў ідалам, якім служыў бацька
ягоны, і пакланяўся ім.
22 І пакінуў ён ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, і не хадзіў шляхам ГОСПАДА.
23 І змовіліся супраць Амона слугі ягоныя, і забілі валадара ў доме ягоным.
24 Але народ зямлі забіў усіх, якія былі змовіўшыся супраць валадара Амона, і паставілі сабе
на валадара замест яго Ёсію, сына ягонага.
25 А іншыя дзеяньні Амона, якія ён рабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
26 І пахавалі яго ў садзе Узіі ў магіле ягонай. І стаў валадаром пасьля яго Ёсія, сын ягоны.

2 Вал 22

1 Ёсія меў восем гадоў, калі пачаў валадарыць, і трыццаць адзін год ён быў валадаром у
Ерусаліме. Імя маці ягонай — Едыда, дачка Адаі з Бацкату.
2 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў усімі шляхамі Давіда, бацькі свайго, і не
зварочваў ані ўправа, ані ўлева.
3 І сталася ў васямнаццатым годзе валадара Ёсіі, паслаў валадар пісара Шафана, сына Ацаліі,
сына Мэшуляма, у Дом ГОСПАДА, кажучы:
4 «Ідзі да Хількіі, вялікага сьвятара. І няхай ён палічыць срэбра, якое ахвяравана ў Доме
ГОСПАДА, што сабралі вартаўнікі парогаў ад народу.
5 І няхай дадуць яго ў рукі майстрам, якія нагладаюць за працамі ў Доме ГОСПАДА, а яны
няхай дадуць яго работнікам, якія працуюць у Доме ГОСПАДА, дзеля направы пашкоджаньняў
у Доме,
6 цесьлярам, будаўнікам, мулярам, і на куплю дрэва, чэсаных камянёў дзеля направы Дому
[Божага].
7 Але ня трэба патрабаваць ад іх адказу за срэбра, якое дадзенае ў рукі іхнія, бо яны працуюць
сумленна».
8 І сказаў Хількія, вялікі сьвятар, пісару Шафану: «Кнігу Закону я знайшоў у Доме ГОСПАДА».
І даў Хількія кнігу Шафану, і ён чытаў яе.
9 І пайшоў пісар Шафан да валадара, і прынёс яму слова гэтае, і сказаў: «Слугі твае ўзялі срэбра,
якое знаходзіцца ў Доме [Божым], і перадалі яго ў рукі загадчыкам працаў у Доме ГОСПАДА».
10 І паведаміў пісар Шафан валадару, кажучы: «Сьвятар Хількія даў мне кнігу». І Шафан
прачытаў яе перад абліччам валадара.
11 І сталася, калі валадар пачуў словы кнігі Закону, ён разьдзёр шаты свае
12 і загадаў валадар сьвятару Хількіі, і Ахікаму, сыну Шафана, і Ахбору, сыну Міхея, і Шафану
пісару, і Асаі, слузе валадара, кажучы:
13 «Ідзіце і спытайце ГОСПАДА адносна мяне, і адносна народу, і адносна ўсяго Юды паводле
словаў кнігі, якая знойдзена, бо вялікі гнеў ГОСПАДА ўзгарэўся супраць нас, бо ня слухалі
бацькі нашыя словаў кнігі гэтай, каб выканаць усё, што ў ёй напісана для нас».
14 І пайшлі сьвятар Хількія, і Ахікам, і Ахбор, і Шафан, і Асая да Хульды прарочыцы, жонкі
Шальлюма, сына Тыквы, сына Хархаса, вартаўніка адзеньня. Яна жыла ў Ерусаліме, у новым
горадзе, і гаварылі з ёй.
15 І яна сказала ім: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “Скажыце чалавеку, які паслаў вас да мяне:
16 "Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я навяду ліха на месца гэтае і на жыхароў ягоных, усе словы кнігі,
якую чытаў валадар Юды,
17 за тое, што яны пакінулі Мяне і кадзілі багам чужым, і гнявілі Мяне ўсімі ўчынкамі рук сваіх.
І ўзгарэўся гнеў Мой на месца гэтае, і не патухне".
18 Адносна валадара Юды, які паслаў вас, каб запытацца ГОСПАДА, скажыце яму так: "Гэта
кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. За тое, што ты слухаў словы [кнігі],
19 і стрывожылася сэрца тваё і ты ўпакорыўся перад абліччам ГОСПАДА, пачуўшы тое, што
прамоўлена супраць гораду гэтага і жыхароў ягоных, што яны будуць спусташэньнем і
праклёнам, і разьдзёр ты шаты свае, і плакаў перад абліччам Маім, Я выслухаў цябе, кажа
ГОСПАД.
20 Таму, вось, Я далучу цябе да бацькоў тваіх, і будзеш ты пахаваны ў магіле тваёй у супакоі,
і вочы твае ня ўбачаць усяго ліха, якое Я спашлю на месца гэтае"”». І яны занесьлі валадару
слова гэтае.

2 Вал 23

1 І паслаў валадар, і сабраліся да яго ўсе старшыні Юды і Ерусаліму.
2 І ўвайшоў валадар у Дом ГОСПАДА, і ўсе людзі Юды, і ўсе жыхары Ерусаліма з ім, і сьвятары,
і прарокі, і ўвесь народ ад малога да вялікага. І прачытаў ён у вушы іхнія ўсе словы Кнігі
Запавету, якую знайшлі ў Доме ГОСПАДА.

3 І стаў валадар на ўзвышэньні, і заключыў запавет перад абліччам ГОСПАДА, што яны будуць
хадзіць за ГОСПАДАМ і будуць захоўваць прыказаньні Ягоныя, сьведчаньні Ягоныя і пастановы
Ягоныя ўсім сэрцам і ўсёй душой, каб выканаць словы запавету гэтага, якія запісаныя ў кнізе
гэтай. І ўвесь народ далучыўся да запавету.
4 І загадаў валадар Хількіі, вялікамі сьвятару, і іншым сьвятарам, і вартаўнікам парогаў, каб
выкінулі са Сьвятыні ГОСПАДА ўсе рэчы, зробленыя для Баала, і для Астарты, і для ўсяго войска
нябеснага. І ён спаліў усё гэта па-за Ерусалімам у даліне Кедрону, а попел іхні занёс у Бэтэль.
5 І прыбраў ён службітаў паганскіх, якіх паставілі валадары Юды, і якія кадзілі на ўзгорках
у гарадах Юды і ў ваколіцах Ерусаліму, і якія кадзілі Баалу, сонцу, месяцу, сузор'ям і ўсяму
войску нябеснаму.
6 І вынес ён з Дому ГОСПАДА Астарту, і [занёс] па-за Ерусалім да ручая Кедрон, і спаліў яе каля
ручая Кедрон, і сьцёр яе на парахно, і кінуў яе на магілы людзей простых.
7 І разваліў ён дамы распусьнікаў, якія былі пры Доме ГОСПАДА, дзе жанчыны ткалі адзеньне
для Астарты.
8 І выгнаў ён усіх сьвятароў [паганскіх] з гарадоў Юды, і апаганіў узгоркі, дзе сьвятары гэтыя
кадзілі, ад Гевы да Бээр-Шэвы. І зруйнаваў узгорак брамы, які быў каля ўваходу ў браму
Егошуа, начальніка гораду, з левага боку ад гарадзкой брамы.
9 І сьвятарам узгоркаў забараніў прыходзіць да ахвярніка ГОСПАДА ў Ерусаліме, толькі маглі
яны есьці праснакі між братамі сваімі.
10 І апаганіў ён Тафэт, які ў даліне Бэн-Гінном, каб ужо ніхто не праводзіў сына свайго або
дачку праз агонь для Малоха.
11 І прыбраў коней, якіх валадары Юды пасьвячалі сонцу, ад уваходу ў Дом ГОСПАДА каля
жытла Натан-Мэлеха, эўнуха, якое на панадворку, і спаліў агнём калясьніцы сонца.
12 І ахвярнікі на даху верхняга пакоя Ахаза, якія зрабілі валадары Юды, і ахвярнікі, якія зрабіў
Манаса ў абодвух панадворках Дому ГОСПАДА, валадар зьнішчыў, і прыбраў адтуль, а пыл ад
іх укінуў у ручай Кедрон.
13 І апаганіў ён узгоркі насупраць Ерусаліму з правага боку гары Аліўнай, якія Салямон,
валадар Ізраіля, паставіў для Астарты, брыдоты Сідонцаў, і для Кемоша, брыдоты Мааву, і для
Мількома, брыдоты сыноў Амона.
14 І паразьбіваў ён слупы, і высек [сьвятыя] гаі, і засыпаў месца іхняе косткамі чалавечымі.
15 І таксама ахвярнік, які ў Бэтэлі, узгорак, зроблены Ерабаамам, сынам Навата, які ўвёў у грэх
Ізраіля, таксама ахвярнік гэты і ўзгорак разваліў, і спаліў, і сьцёр у пыл, і спаліў Астарту.
16 І глянуў Ёсія, і ўбачыў магілы, якія там [былі] на гары, і паслаў, і загадаў узяць косткі з
магілаў, і спаліў іх на ахвярніку, і апаганіў яго паводле слова ГОСПАДА, якое абвясьціў чалавек
Божы, што абвяшчаў падзеі гэтыя.
17 І сказаў [Ёсія]: «Што гэта за помнік, які я бачу?» І сказалі яму жыхары гораду: «Гэта магіла
чалавека Божага, які прыйшоў з Юды і абвясьціў тое, што ты зрабіў з ахвярнікам у Бэтэлі».
18 І сказаў ён: «Пакіньце яго [ў супакоі]. Няхай ніхто не чапае костак ягоных». І косткі ягоныя
пакінулі некранутымі разам з косткамі прарока, які прыйшоў з Самарыі.
19 І таксама ўсе дамы ўзгоркаў, якія [былі] ў гарадах Самарыі і якія пабудавалі валадары
Ізраіля, каб гнявіць [Госпада], Ёсія разваліў і зрабіў з імі так, як зрабіў у Бэтэлі.
20 І пазабіваў ён усіх сьвятароў узгоркаў, якія там [былі] пры ахвярніках, і спаліў на іх косткі
чалавечыя, і вярнуўся ў Ерусалім.
21 І загадаў валадар усяму народу, кажучы: «Спраўляйце Пасху ГОСПАДА, Бога вашага, як
напісана ў кнізе Запавету гэтага».
22 Бо не была спраўляная Пасха ад дзён судзьдзяў, якія судзілі Ізраіля, і праз усе дні валадароў
Ізраіля і валадароў Юды.
23 Толькі ў васямнаццатым годзе валадара Ёсіі спраўлялі Пасху ГОСПАДА ў Ерусаліме.
24 І таксама Ёсія вынішчыў тых, якія выклікалі духаў памерлых, і варажбітоў, і [зьнішчыў]
тэрафімаў, ідалаў і ўсе брыдоты, якія былі бачаныя ў зямлі Юды і ў Ерусаліме, каб выканаць
словы Закону, запісаныя ў кнізе, якую знайшоў сьвятар Хількія ў Доме ГОСПАДА.

25 Перад ім не было такога валадара, які б навярнуўся да ГОСПАДА ўсім сэрцам сваім і ўсёю
душою сваёй, і ўсёю сілаю сваёй паводле ўсяго Закону Майсея, і пасьля яго не зьявіўся падобны
яму.
26 Аднак ГОСПАД не спыніў ярасьці гневу Свайго, які ўзгарэўся супраць Юды за ўсе зьнявагі,
якімі гнявіў Яго Манаса.
27 І сказаў ГОСПАД: «Нават Юду Я адкіну ад аблічча Майго, як Я адкінуў Ізраіля. І адкіну горад
гэты, які Я выбраў, Ерусалім, і Дом [Божы], пра які Я сказаў: “Там будзе імя Маё!”»
28 А іншыя дзеяньні Ёсіі і ўсё, што ён зрабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
29 У дні ягоныя фараон Нэхо, валадар Эгіпту, пайшоў на валадара Асірыі на раку Эўфрат. І
выйшаў насустрач яму валадар Ёсія, і, калі ўбачыў яго, быў забіты ім у Мэгіддо.
30 І павезьлі слугі ягоныя забітага на калясьніцы з Мэгіддо, і прывезьлі ў Ерусалім, і пахавалі
яго ў магіле ягонай. А народ краіны ўзяў Егаахаза, сына ягонага, і памазаў яго, і паставіў яго
валадаром на месца бацькі ягонага.
31 Егаахаз меў дваццаць тры гады, калі стаў валадаром, і валадарыў ён у Ерусаліме тры месяцы.
Імя маці ягонай — Хамуталь, дачка Ярэміі з Лібны.
32 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, паводле ўсяго таго, што рабілі бацькі ягоныя.
33 І фараон Нэхо ўвязьніў яго ў Рыўлі, у зямлі Хамат, каб не валадарыў ён у Ерусаліме, і наклаў
на краіну даніну — сто талентаў срэбра і талент золата.
34 І паставіў фараон Нэхо валадаром Эліякіма, сына Ёсіі, замест Ёсіі, бацькі ягонага, і зьмяніў
імя ягонае на Егаякім. А Егаахаза ўзяў і завёў у Эгіпет, і ён там памёр.
35 І Егаякім даваў фараону срэбра і золата, і мусіў ён ападаткаваць зямлю, каб даваць срэбра
паводле [слова] з вуснаў фараона, і ад кожнага чалавека ў зямлі [Юды] паводле вызначанага
падатку ён вымагаў срэбра і золата, каб даваць фараону Нэхо.
36 Егаякім меў дваццаць пяць гадоў, калі стаў валадаром, і адзінаццаць гадоў валадарыў у
Ерусаліме. Імя маці ягонай — Зэбіда, дачка Пэдаі з Румы.
37 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, усё, як рабілі бацькі ягоныя.

2 Вал 24

1 У дні ягоныя прыйшоў Навухаданосар, валадар Бабілону, і Егаякім стаўся слугой ягоным на
тры гады, а пасьля збунтаваўся супраць яго.
2 І ГОСПАД паслаў супраць яго дружыны Халдэйцаў, і дружыны Сірыйцаў, і дружыны
Мааўлянаў, і дружыны сыноў Амона, і паслаў іх супраць Юды, каб зьнішчыць яго паводле слова
ГОСПАДА, якое Ён прамовіў праз слугаў Сваіх, прарокаў.
3 І гэта сталася праз [слова] з вуснаў ГОСПАДА супраць Юды, каб адкінуць яго ад аблічча Свайго
за грахі Манасы, якія ён рабіў,
4 і таксама за кроў нявінную, якую ён праліў і напоўніў Ерусалім крывёю нявіннай. І не хацеў
ГОСПАД прабачыць.
5 А іншыя дзеяньні Егаякіма і ўсё, што ён рабіў, запісаныя ў Кнізе летапісаў валадароў Юды.
6 І супачыў Егаякім з бацькамі сваімі, а замест яго стаў валадаром Егаяхін, сын ягоны.
7 І валадар Эгіпецкі не выходзіў ужо з зямлі сваёй, бо валадар Бабілону заваяваў усё ад ручая
Эгіпецкага аж да ракі Эўфрат, усё, што належала да валадара Эгіпту.
8 Егаяхін меў васямнаццаць гадоў, калі стаў валадаром, і валадарыў ён у Ерусаліме тры
месяцы. Імя маці ягонай — Нэхушта, дачка Эльнатана з Ерусаліму.
9 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, усё, як рабіў бацька ягоны.
10 У той час слугі Навухаданосара, валадара Бабілону, выйшлі супраць Ерусаліму і абляглі
горад.
11 І прыйшоў Навухаданосар, валадар Бабілону, да гораду, а слугі ягоныя аблягалі яго.
12 І выйшаў Егаяхін, валадар Юды, разам з маці сваёй, і слугамі сваімі, князямі сваімі і эўнухамі
сваімі да валадара Бабілону. І валадар Бабілону ўзяў яго ў восьмым годзе валадараньня свайго.

13 І забраў ён таксама ўсе скарбы Дому ГОСПАДА і скарбы дому валадара, і паламаў усе залатыя
рэчы, якія зрабіў Салямон, валадар Ізраіля, у Сьвятыні ГОСПАДА, паводле таго, што прамовіў
ГОСПАД.
14 І перасяліў ён у няволю ўвесь Ерусалім, усіх князёў, усіх ваяроў мужных, дзесяць тысячаў
палонных, і ўсіх кавалёў і цесьляроў. І не засталося нікога, толькі галота людзей зямлі.
15 І перасяліў ён таксама Егаяхіна ў Бабілон, і маці валадара, і жонак валадара, і эўнухаў
ягоных, і магнатаў зямлі забраў у няволю з Ерусаліму ў Бабілон.
16 І ўсіх ваяроў сем тысячаў, і кавалёў, і цесьляроў тысячу, і ўсіх волатаў, здатных да вайны,
вывеў валадар Бабілону ў няволю, у Бабілон.
17 І валадар Бабілонскі паставіў валадаром дзядзьку [Егаяхіна] Матанію, і зьмяніў імя ягонае
на Сэдэкію.
18 Сэдэкія меў дваццаць адзін год, калі стаў валадаром, і ён валадарыў у Ерусаліме адзінаццаць
гадоў. Імя маці ягонай — Хамуталь, дачка Ярэміі з Лібны.
19 І рабіў ён ліхоту ў вачах ГОСПАДА, усё, як рабіў Егаяхін.
20 І сталася гэта з прычыны гневу ГОСПАДА на Ерусалім і Юду, і Ён адкінуў іх ад аблічча Свайго.
І Сэдэкія збунтаваўся супраць валадара Бабілонскага.

2 Вал 25

1 І сталася ў дзявятым годзе валадараньня ягонага, у дзясятым месяцы, у дзясяты [дзень]
месяца, прыйшоў Навухаданосар, валадар Бабілонскі, з усім войскам сваім да Ерусаліму, і
аблёг яго, і пабудаваў вакол яго валы.
2 І горад быў у аблозе аж да адзінаццатага году валадара Сэдэкіі.
3 У дзявяты [дзень] месяца пачаўся голад у горадзе, і не было ўжо хлеба для народу зямлі.
4 І быў зроблены вылом у муры гораду, і ўначы ўсе ваяры [ўцяклі] па шляху брамы між мурамі,
што каля саду валадарскага, а Халдэйцы былі вакол гораду. І выйшлі яны на шлях да Арабы.
5 І войска Халдэйцаў кінулася ў пагоню за валадаром, і дагналі яго на раўніне каля Ерыхону, і
ўсё войска ягонае пакінула яго.
6 І схапілі валадара, і прывялі яго да валадара Бабілонскага ў Рыўлю, і выдадзены быў на яго
прысуд.
7 І сыноў Сэдэкіі забілі на вачах ягоных, і вырвалі вочы Сэдэкіі, і закулі яго ў кайданы
мядзяныя, і завялі ў Бабілон.
8 У пятым месяцы, у сёмы [дзень] месяца, а гэта быў дзевятнаццаты год Навухаданосара,
валадара Бабілонскага, увайшоў у Ерусалім Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, слуга
валадара Бабілонскага.
9 І спаліў ён Дом ГОСПАДА, і дом валадара, і ўсе дамы ў Ерусаліме, і кожны вялікі дом спаліў
агнём.
10 І войска Халдэйскае, якое [было] разам з начальнікам целаахоўнікаў, зруйнавала мур вакол
Ерусаліму.
11 А рэшту народу, якая засталася ў горадзе, і ўцекачоў, якія ўцяклі да валадара Бабілонскага, і
рэшту мноства [людзей простых] Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, перасяліў у няволю.
12 І некаторых з галоты зямлі начальнік целаахоўнікаў пакінуў як вінаградараў і земляробаў.
13 І паламалі Халдэйцы слупы мядзяныя, якія ў Доме ГОСПАДА, і падставы, і мора мядзянае,
якое ў Доме ГОСПАДА, і забралі медзь іхнюю ў Бабілон.
14 І забралі катлы, лапаткі, нажніцы, лыжкі і ўвесь посуд мядзяны, якім карысталіся пры
служэньні.
15 Таксама кадзільніцы і келіхі, якія былі з золата і срэбра, забраў начальнік целаахоўнікаў.
16 А медзі з двух слупоў і аднаго мора, і падставаў, якія Салямон зрабіў для Дому ГОСПАДА,
нельга было зважыць.
17 Васямнаццаць локцяў меў у вышыню адзін слуп, і галавіца ягоная была з медзі, а вышыня
галавіцы была тры локці. Вакол галавіцы было сплеціва з яблыкамі гранату, усё з медзі. І другі
слуп меў таксама сплеціва.

18 І начальнік целаахоўнікаў узяў Сэраю сьвятара і другога сьвятара Сафонію, і трох
вартаўнікоў парогаў.
19 А з горада ўзяў ён аднаго эўнуха, які быў начальнікам войска, і пяць чалавек, якія бачылі
аблічча валадара, якіх знайшлі ў горадзе, і галоўнага пісара войска, які запісваў народ зямлі,
і шэсьцьдзясят людзей простых, якіх знайшлі ў горадзе.
20 І ўзяў іх Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, і завёў да валадара Бабілонскага ў Рыўлю.
21 І валадар Бабілонскі загадаў забіць іх, і забіў іх у Рыўлі, у зямлі Хамат. І быў Юда выселены
з зямлі сваёй.
22 А над народам, што застаўся ў зямлі Юды, які пакінуў [там] Навухаданосар, валадар
Бабілонскі, ён паставіў начальнікам Гедалію, сына Ахікама, сына Шафана.
23 І ўсе начальнікі войска і людзі іхнія пачулі, што валадар Бабілонскі прызначыў Гедалію
[начальнікам], і прыйшлі да Гедаліі ў Міцпу. І [прыйшлі] Ізмаэль, сын Нэтаніі, Ёханан, сын
Карэаха, Сэрая, сын Танхумэта з Нэтофы, і Язанія, сын Маахата, яны і людзі іхнія.
24 І прысягнуў Гедалія ім і людзям іхнім, і сказаў ім: «Ня бойцеся служыць Халдэйцам, жывіце
на зямлі і служыце валадару Бабілонскаму, і добра будзе вам».
25 Але ў сёмым месяцы прыйшоў Ізмаэль, сын Нэтаніі, сына Элішамы, з насеньня
валадарскага, і дзесяць чалавек з ім, і забілі яны Гедалію, і забілі Юдэяў і Халдэйцаў, якія былі
з ім у Міцпе.
26 І ўстаў увесь народ ад малога да вялікага, і начальнікі войска, і пайшлі ў Эгіпет, бо баяліся
аблічча Халдэйцаў.
27 І сталася ў трыццаць сёмым годзе пасьля высяленьня ў няволю Егаяхіна, валадара Юды, у
дванаццаты месяц, у дваццаць сёмы [дзень] месяца, Эвіль-Мэрадах, валадар Бабілонскі, у год,
у які пачаў валадарыць, вызваліў Егаяхіна, валадара Юды, з вязьніцы.
28 І ён гаварыў з ім добра, і падняў пасад ягоны па-над пасадамі валадароў, якія [былі] з ім у
Бабілоне.
29 І зьняў [Егаяхін] шаты вязьнічныя, і еў заўсёды хлеб перад абліччам [Эвіль-Мэрадаха] ў-ва
ўсе дні жыцьця свайго.
30 І той забясьпечваў яго заўсёды ўтрыманьнем валадарскім, дзень у дзень, у-ва ўсе дні
жыцьця ягонага.

ПЕРШАЯ КНІГА ЛЕТАПІСАЎ

1 Адам, Сэт, Энос,
2 Кейнан, Магалялеэль, Ярэд,
3 Энох, Мэтушэлях, Лямэх,
4 Ной, Сэм, Хам і Яфэт.
5 Сыны Яфэта: Гамэр, Магог, Мадай, Яван, Туваль, Мэшэх і Тырас.
6 Сыны Гамэра: Ашкеназ, Рыфат і Тагарма.
7 Сыны Явана: Эліша, Таршыш, Кіттым і Раданім.
8 Сыны Хама: Куш, Міцраім, Пут і Ханаан.
9 Сыны Куша: Сэва, Хавіля, Саўта, Раама і Саўтэха. А сыны Раамы: Шэва і Дэдан.
10 Куш нарадзіў Німрода; ён пачаў быць магутным на зямлі.
11 А Міцраім нарадзіў Людыма, Анаміма, Легавіма, Нафтухіма,
12 Патрусіма і Касьлюхіма, ад якіх паходзяць Філістынцы, і Кафторыма.
13 А Ханаан нарадзіў Сідона, першароднага свайго, Хета,
14 Евусэя, Амарэя, Гіргашэя,
15 Хівея, Аркея, Сінэя,
16 Арвадэя, Цэмарэя і Хаматэя.
17 Сыны Сэма: Элям, Асур, Арпахшад, Люд, Арам, Уц, Хуль, Гетэр і Мэшэх.
18 Арпахшад нарадзіў Шэляха, а Шэлях нарадзіў Эвэра.
19 У Эвэра нарадзіліся два сыны: імя аднаго Пэлег, бо ў дні ягоныя разьдзялілася зямля; а імя брата ягонага — Ёктан.
20 Ёктан нарадзіў Альмадада, Шалефа, Хацармавэта, Яраха,
21 Гадарама, Узаля, Дыклю,
22 Аваля, Авімаэля, Шэву,
23 Афіра, Хавілю і Ёвава. Гэтыя ўсе — сыны Ёктана.
24 Сэм, Арпахшад, Шэлях,
25 Эвэр, Пэлег, Рэву,
26 Сэруг, Нахор, Тэрах,
27 Абрам, ён жа Абрагам.
28 Сыны Абрагама: Ісаак і Ізмаэль.
29 Вось радавод іхні: першародны Ізмаэля Наваёт, Кедар, Адбээль, Міўсам,
30 Мішма, Дума, Маса, Хадад, Тэма,
31 Етур, Нафіш і Кедма. Гэта сыны Ізмаэля.
32 [Вось] сыны Кетуры, наложніцы Абрагама; яна нарадзіла Зімрана, Ёкшана, Мэдана, Мадыяна, Ішбака і Шуаха. А сыны Ёкшана: Шэва і Дэдан.
33 Сыны Мадыяна: Эфа, Этэр, Ханох, Авіда і Эльдаа. Гэтыя ўсе — сыны Кетуры.
34 І нарадзіў Абрагам Ісаака. Сыны Ісаака: Эзаў і Ізраіль.
35 Сыны Эзава: Эліфаз, Рэўэль, Еуш, Ялам і Карах.
36 Сыны Эліфаза: Тэман, Амар, Цэфо, Гатам, Кеназ, Тымна і Амалек.
37 Сыны Рэўэля: Нахат, Зэрах, Шамма і Міза.
38 А сыны Сэіра: Лётан, Шаваль, Цывеон, Ана, Дышон, Эцэр і Дышан.
39 Сыны Лётана: Хоры і Гамам; і сястра Лётана — Тымна.
40 Сыны Шаваля: Алян, Манахат, Эваль, Шэфі і Анам. А сыны Цывеона: Ая і Ана.
41 Сыны Аны: Дышон. А сыны Дышона: Хамран, Эшбан, Ітран і Херан.
42 Сыны Эцэра: Більган, Зааван і Яакан. Сыны Дышана: Уц і Аран.
43 І вось валадары, якія валадарылі ў зямлі Эдом, раней за валадараньне валадароў у Ізраілі: Бэла, сын Бэора, і імя гораду ягонага — Дынгава.

44 І памёр Бэла, і валадарыў пасьля яго Ёваў, сын Зэраха, з Боцры.
45 І памёр Ёваў, і валадарыў пасьля яго Хушам, з зямлі Тэман.
46 І памёр Хушам, і валадарыў пасьля яго Гадад, сын Бэдада, які пабіў Мадыянцаў на полі Мааўскім; імя гораду ягонага — Авіт.
47 І памёр Гадад, і валадарыў пасьля яго Самла з Масрэкі.
48 І памёр Самла, і валадарыў пасьля яго Шауль з Рэхавоту, што каля ракі.
49 І памёр Шауль, і валадарыў пасьля яго Баал-Ханан, сын Ахбора.
50 І памёр Баал-Ханан, і валадарыў пасьля яго Гадад; і імя гораду ягонага — Паі; імя жонкі ягонай — Мэгетабэль, дачка Матрэды, дачкі Мэзагавы.
51 І памёр Гадад. І былі князі ў Эдома: князь Тымна, князь Альва, князь Етэт,
52 князь Агалівама, князь Эля, князь Пінон,
53 князь Кеназ, князь Тэман, князь Міўцар,
54 князь Магдыэль, князь Ірам. Гэта князі Эдому.

1 Лет 2

1 Гэта сыны Ізраіля: Рубэн, Сымон, Левій, Юда, Ісахар, Завулён,
2 Дан, Язэп, Бэн'ямін, Нэфталі, Гад і Асэр.
3 Сыны Юды: Ер, Анан і Шэля — тры нарадзіліся ў яго ад дачкі Шуа, Ханааянкі. І быў Ер, першародны Юды, ліхі ў вачах ГОСПАДА, і Ён усьмерціў яго.
4 А Тамар, нявестка ягоная, нарадзіла яму Пэрэса і Зараха. Усіх сыноў у Юды было пяць.
5 Сыны Пэрэса: Хецрон і Хамуль.
6 Сыны Зараха: Зімры, Этан, Гэман, Хальколь і Дара; усіх іх пяцёра.
7 Сыны Хармі: Ахар, які прынёс засмучэньне Ізраілю, бо быў няверны ў заклятым.
8 Сыны Этана: Азарыя.
9 Сыны Хецрона, якія нарадзіліся ў яго: Ерахмээль, Рам і Хелувай.
10 Рам нарадзіў Амінадава; Амінадаў нарадзіў Нахшона, князя сыноў Юды;
11 Нахшон нарадзіў Сальму; Сальма нарадзіў Боаза;
12 Боаз нарадзіў Абэда; Абэд нарадзіў Есэя;
13 Есэй нарадзіў першароднага свайго Эліява, другога — Амінадава, трэцяга — Шыму,
14 чацьвёртага — Нэтанэля, пятага — Раддая,
15 шостага — Оцэма, сёмага — Давіда.
16 І былі сёстры іхнія: Цэруя і Абігайль. Сыны Цэруі: Абішай, Ёаў і Асаэль, тры.
17 Абігайль нарадзіла Амасу; а бацька Амасы — Этэр Ізмаэлец.
18 А Халеў, сын Хецрона, нарадзіў ад Азувы, жонкі сваёй, і ад Ероты. І гэта сыны ягоныя: Ешэр, Шаваў і Ардон.
19 І памерла Азува; і ўзяў сабе Халеў Эфрату, і яна нарадзіла яму Хура.
20 Хур нарадзіў Урыю; Урыя нарадзіў Бэцалеэля.
21 Потым Хецрон прыйшоў да дачкі Махіра, бацькі Гілеада, і ўзяў яе, а ён меў шэсьцьдзясят гадоў, і яна нарадзіла яму Сэгува.
22 Сэгуў нарадзіў Яіра, і было ў яго дваццаць тры гарады ў зямлі Гілеад.
23 І забраў Гешур і Арам у іх паселішчы Яіра, Кенат з вёскамі ягонымі, шэсьцьдзясят гарадоў. Гэтыя ўсе — сыны Махіра, бацькі Гілеада.
24 І памёр Хецрон у Халеў-Эфраце, і была жонка Хецрона, Ава, і яна нарадзіла яму Ашхура, бацьку Тэкоа.
25 І былі сыны Ерахмээля, першароднага Хецрона: першародны Рам, Буна, Орэн, Оцэм, Ахія.
26 І была ў Ерахмээля іншая жонка, імя ейнае — Атара; яна — маці Онама.
27 І былі сыны Рама, першароднага Ерахмээля: Маац, Ямін і Экер.
28 І былі сыны Онама: Шаммай і Яда. Сыны Шаммая: Надаў і Абішур.
29 А імя жонкі Абішура — Абігайль; і яна нарадзіла яму Ахбана і Маліда.
30 Сыны Надава: Сэлед і Аппаім. І памёр Сэлед бязьдзетным.

31 Сыны Аппаіма: Іш. Сын Іша: Шэшан. Сын Шэшана: Ахлай.
32 Сыны Яды, брата Шаммая: Етэр і Ёнатан. І памёр Етэр бязьдзетным.
33 Сыны Ёнатана: Пэлет і Заза. Гэта былі сыны Ерахмээля.
34 І не было ў Шэшана сыноў, адно дочкі. У Шэшана быў слуга Эгіпцянін, імя ягонае — Ярха.
35 І даў Шэшан дачку сваю Ярху, слузе свайму, за жонку, і яна нарадзіла яму Аттая.
36 Аттай нарадзіў Натана; Натан нарадзіў Завада;
37 Завад нарадзіў Ефлала; Ефлал нарадзіў Абэда;
38 Абэд нарадзіў Егу; Егу нарадзіў Азарыю;
39 Азарыя нарадзіў Халеца; Халец нарадзіў Элясу;
40 Эляса нарадзіў Сісмая; Сісмай нарадзіў Шальлюма;
41 Шальлюм нарадзіў Екамію; Екамія нарадзіў Элішаму.
42 Сыны Халева, брата Ерахмээля: Мэша, першародны ягоны, ён — бацька Зіфа; і сыны Марэшы, бацькі Хеўрона.
43 Сыны Хеўрона: Карах, Тапуах, Рэкем і Шэма.
44 Шэма нарадзіў Рахама, бацьку Яркаама; а Рэкем нарадзіў Шаммая.
45 Сын Шаммая: Маон, а Маон — бацька Бэт-Цура.
46 І Эфа, наложніца Халева, нарадзіла Харана, Моцу і Газэза. А Харан нарадзіў Газэза.
47 Сыны Ягдая: Рэгем, Ётам, Гешан, Пэлет, Эфа і Шааф.
48 Наложніца Халева, Мааха, нарадзіла Шэвэра і Тырхану.
49 І нарадзіла яна Шаафа, бацьку Мадманны, Шэву, бацьку Махбэны і бацьку Гівы. А дачка Халева — Ахса.
50 Гэта былі сыны Халева, сына Хура, першароднага Эфраты: Шаваль, бацька Кірыят-Ярыма,
51 Сальма, бацька Бэтлеема, Харэф, бацька Бэт-Гадэра.
52 І былі сыны ў Шаваля, бацькі Кірыят-Ярыма: Гароэ, Хацы, Мэнухот.
53 І [вось] сем'і Кірыят-Ярыма: Ітрычы, Путычы, Шуматычы і Мішраічы. Ад іх паходзяць Царацяне і Эштааляне.
54 Сыны Сальмы: Бэтлеем і Нэтафацяне, Атрот, Бэт-Ёваў і палова Мэнахцічаў, і Царане.
55 Сем'і кніжнікаў, якія жылі ў Ябэцы: Тырацічы, Шымацічы, Сухацічы. Гэта Кіняне, якія паходзяць ад Хамата, бацькі дому Рэхава.

1 Лет 3

1 А гэтыя былі сыны Давіда, якія нарадзіліся ў яго ў Хеўроне: першародны Амнон, ад Ахінаамы з Езрээлю; другі — Даніэль, ад Абігайль з Карэлю;
2 трэці — Абсалом, сын Маахі, дачкі Талмая, валадара Гешуру; чацьвёрты — Адонія, сын Хагіты;
3 пяты — Шэфатыя, ад Абіталь; шосты — Ітрэам, ад Еглаі, жонкі ягонае.
4 Шасьцёра нарадзілася ў яго ў Хеўроне. І валадарыў ён там сем гадоў і шэсьць месяцаў; і трыццаць тры гады валадарыў у Ерусаліме.
5 А гэтыя нарадзіліся ў яго ў Ерусаліме: Шыма, Шаваў, Натан і Салямон, чатыры ад Бат-Шэвы, дачкі Аміэля;
6 і Ібхар, Элішама, Эліфэлет,
7 Нагах, Нэфэг, Яфія,
8 Элішама, Эліяда і Эліфэлет — дзевяць.
9 Усе гэтыя — сыны Давіда, акрамя сыноў наложніцаў, і Тамар, сястра іхняя.
10 Сын Салямона: Рэхабаам; сын ягоны — Абія; сын ягоны — Аса; сын ягоны — Язафат;
11 сын ягоны — Ёрам; сын ягоны — Ахазія; сын ягоны — Ёаш;
12 сын ягоны — Амазія; сын ягоны — Азарыя; сын ягоны — Ётам;
13 сын ягоны — Ахаз; сын ягоны — Эзэкія; сын ягоны — Манаса;
14 сын ягоны — Амон; сын ягоны — Ёсія.
15 Сыны Ёсіі: першародны Ёханан, другі — Егаякім, трэці — Сэдэкія, чацьвёрты — Шальлюм.
16 Сыны Егаякіма: Ехонія, сын ягоны, і Сэдэкія, сын ягоны.
17 Сыны Ехоніі: Асір, Шэалтыэль, сын ягоны,

18 Малькірам, Пэдая, Шэнацар, Екамія, Гашама і Нэдавія.
19 Сыны Пэдаі: Зэрубабэль і Шымэй. А сыны Зэрубабэля: Мэшулям, Хананія, і Шэляміт, сястра іхняя,
20 і Хашува, Агель, Бэрэхія, Хасадыя, Юшаў-Хэсэд — пяцёра.
21 Сыны Хананіі: Пэлятыя і Ешая, сыны Рэфаі, сыны Арнана, сыны Абадыі, сыны Шэханіі.
22 Сыны Шэханіі: Шэмая. А сыны Шэмаі: Хаттуш, Ігаал, Барыях, Нэарыя, Шафат — шасьцёра.
23 А сыны Нэарыі: Эліаэнай, Эзэкія і Азрыкам — тры.
24 Сыны Эліаэная: Гадавія, Эліяшыў, Пэлая, Аккуў, Ёханан, Дэлая і Анані — сямёра.

1 Лет 4

1 Сыны Юды: Пэрэс, Хецрон, Хармі, Хур і Шаваль.
2 А Рэая, сын Шаваля, нарадзіў Яхата; Яхат нарадзіў Ахумая і Лягада. Гэта сем'і Царацянаў.
3 А гэтыя з бацькі Этама: Ізрээль, Ішма і Ідбаш, а імя сястры іхняй — Гацэлельпоні.
4 А Пэнуэль — бацька Гедора, а Эзэр — бацька Хуша. Гэта сыны Хура, першароднага Эфраты, бацькі Бэтлеема.
5 А ў Ахшура, бацькі Тэкоа, былі дзьве жонкі: Хэлея і Наара.
6 І нарадзіла Наара яму Ахузама, Хэфэра, Тэмэні і Ахаштары. Гэта сыны Наары.
7 Сыны Хэлеі: Цэрэт, Цахар і Этнан.
8 А Коц нарадзіў Анува і Цавэва, і сем'і Ахархэля, сына Гарума.
9 І быў Ябэц найбольш паважаны сярод братоў сваіх. А маці ягоная назвала імя ягонае Ябэц, кажучы: «Бо я нарадзіла яго з болем».
10 І клікаў Ябэц да Бога Ізраіля, кажучы: «О каб Ты, дабраслаўляючы, дабраславіў мяне, і пашырыў межы мае, і аб рука Твая была са мною, і каб Ты захаваў ад злога, каб я не гараваў!» І паслаў яму Бог тое, чаго ён прасіў.
11 І Хелуў, брат Шухі, нарадзіў Мэхіра, ён — бацька Эштона.
12 А Эштон нарадзіў Бэт-Рафу, Пасэаха і Тэхінну, бацьку Ір-Нахаша. Гэта людзі Рэхі.
13 А сыны Кеназа: Атніэль і Сэрая. А сыны Атніэля: Хатат.
14 І Мэанатай нарадзіў Офру, а Сэрая нарадзіў Ёава, бацьку Гэ-Гарашым, бо яны былі рамесьнікі.
15 І сыны Халева, сына Ефунны: Іру, Эла і Наам. А сыны Элы: Кеназ.
16 А сыны Егальлелеля: Зіф, Зіфа, Тырыя і Асарээль.
17 А сыны Эзры: Етэр, Мэрэд, Эфэр і Ялон. І зачала [Бітыя], і нарадзіла Мірыяма, Шаммая і Ішбаха, бацьку Эштэмоа.
18 І жонка ягоная Юдыя нарадзіла Ерэда, бацьку Гедора, і Хэвэра, бацьку Сахо, і Екутыэля, бацьку Занааха. Гэта сыны Бітыі, дачкі фараона, якую ўзяў Мэрэд.
19 А сыны жонкі Годыі, сястры Нахама: бацька Кейлы Гарміцяніна і Эштэмоа Маахацяніна.
20 Сыны Сымона: Амнон, Рынна, Бэн-Ханан і Тылон. Сыны Ішыі: Захот і Бэн-Захот.
21 Сыны Шэлі, сына Юды: Ер, бацька Лехі, і Лаада, бацька Марэшы, і сем'і дому майстроў вісону з Бэт-Ашбэі,
22 і Ёкім, і людзі Хазэвы, і Ёаш, і Сараф, якія мелі ўласнасьць у Мааве, і Яшувілехэм. Гэта справы старадаўнія.
23 Яны — ганчары, і жылі ў Нэтаіме і Гедэры; яны жылі там у валадара дзеля працаў ягоных.
24 Сыны Сымона: Нэмуэль, Ямін, Ярыў, Зэрах, Шауль;
25 сын ягоны — Шальлюм, сын ягоны — Міўсам; сын ягоны — Мішма.
26 А сыны Мішмы: сын ягоны — Хамуэль, сын ягоны — Заккур, сын ягоны — Шымэй.
27 У Шымэя [было] шаснаццаць сыноў і шэсьць дачок; а браты ягоныя ня мелі шмат сыноў, і ўсе сем'і іхнія не былі так шматлікія, як сыны Юды.
28 І жылі яны ў Бээр-Шэве, Маладзе, Хацар-Шуале,
29 Білзе, Ецэме, Таладзе,
30 Бэтуэлі, Харме і Цыклягу,

31 у Бэт-Маркавоце, Хацар-Сусіме, Бэт-Бірэі і Шаарыме. Гэта гарады іхнія да валадараньня
Давіда.
32 А вёскі іхнія: Этам, Аін, Рымон, Тахет і Ашан — пяць гарадоў.
33 І ўсе вёскі іхнія, якія былі навокал гарадоў гэтых аж да Баалу. Гэта сядзібы іхнія і сьпісы
родаў іхніх.
34 Мэшаваў, Ямлеха, Ёша, сын Амацыі,
35 Ёэль, Егу, сын Ёшывіі, сына Сэраі, сына Асіэля,
36 Элеаэнай, Яакова, Ешахая, Асая, Адыэль, Есімээль, Бэная,
37 Зіза, сын Шыфіі, сына Альлёна, сына Едаі, сына Шымры, сына Шэмаі.
38 Гэта тыя, што ўвайшлі ў імёны князёў сем'яў сваіх, і дом бацькоў іхніх вельмі памножыўся.
39 І яны дайшлі да ўваходу Гедор, да ўсходняга боку даліны, шукаць пашу для чародаў сваіх;
40 і знайшлі пашу сытую і добрую, і зямлю прасторную, і мірную, і бясьпечную, бо ад Хама
[паходзілі] тыя, што жылі там перад імі.
41 І прыйшлі тыя, чые імёны запісаныя ў дні Эзэкіі, валадара Юды, і разбурылі намёты іхнія,
і [пабілі] мэунімаў, якіх знайшлі там, і палажылі на іх закляцьце аж да сёньняшняга дня, і
жывуць на месцы іхнім, бо там была паша для чародаў іхніх.
42 З іх жа, з сыноў Сымона, пайшлі на гару Сэір пяцьсот чалавек, і [былі] Пэлятыя, Нэарыя,
Рэфая і Узіэль, сыны Ішыі на чале іх.
43 І яны пабілі там рэшту пазасталых ад Амалека, і жывуць там аж да сёньняшняга дня.

1 Лет 5

1 Сыны Рубэна, першароднага Ізраіля, бо ён — першародны, але як ён зганьбіў ложак бацькі
свайго, першародзтва ягонае аддадзена сынам Язэпа, сына Ізраіля, хоць яны ня лічацца
першароднымі.
2 Бо Юда быў найбольшы з братоў сваіх, і ўладар з яго, але першародзтва [належыць] Язэпу.
3 Сыны Рубэна, першароднага Ізраіля: Ханох, Пальлю, Хецрон і Хармі.
4 Сыны Ёэля: Шэмая, сын ягоны; сын ягоны — Гог, сын ягоны — Шымэй;
5 сын ягоны — Міха; сын ягоны — Рэая; сын ягоны — Баал;
6 сын ягоны — Бээра, якога завёў у палон Тыглат-Пільнэсэр, валадар Асірыі. Ён — князь [сыноў]
Рубэна.
7 І браты ягоныя паводле сем'яў іхніх, калі лічылі радаводы іхнія: галоўны Еэль, і Захарыя,
8 і Бэла, сын Азаза, сына Шэмы, сына Еэля. Ён жыў у Араэры аж да Нэво і Баал-Мэону.
9 А на ўсход ён жыў аж да ўваходу ў пустыню, ад ракі Эўфрат, бо чароды іхнія былі шматлікія
ў зямлі Гілеад.
10 У дні Саўла яны ваявалі з Агаранамі, якія трапілі ў рукі іхнія; і яны жылі ў намётах іхніх па
ўсім усходзе Гілеаду.
11 Сыны Гада жылі насупраць іх у зямлі Башан аж да Сальхі.
12 Ёэль [быў] галоўны, а Шафам — другі, і Янай, і Шафат [жылі] ў Башане.
13 І браты іхнія з дому бацькоў іхніх: Міхаэль, Мэшулям, Шэва, Ёрай, Якан, Зія, Эвэр — сямёра.
14 Гэта сыны Абхаіла, сына Хура, сына Ярааха, сына Гілеада, сына Міхаэля, сына Ешышая, сына
Яхдо, сына Буза.
15 Ахі, сын Абдыэля, сына Гуні — галоўны ў доме бацькоў іхніх.
16 І яны жылі ў Гілеадзе, у Башане і ў мястэчках ягоных, і па ўсіх пашах Шарону аж да межаў
іхніх.
17 Усе яны перапісаныя ў дні Ётама, валадара Юды, і ў дні Ерабаама, валадара Ізраіля.
18 Сыноў Рубэна і Гада, і паловы калена Манасы, сыноў мужных, мужоў, якія носяць шчыт
і меч і страляюць з луку, і спрактыкаваных у бітвах, [было] сорак чатыры тысячы сямсот
шэсьцьдзясят тых, што выходзілі як войска.
19 І вялі вайну з Агаранамі Етур, Нафіш і Надаў.
20 І атрымалі яны дапамогу супраць іх, былі аддадзеныя ў рукі іхнія Агаране і ўсё, што [было]
ў іх, бо яны ў часе бітвы клікалі да Бога, і Ён даў ім упрасіць Сябе, бо яны спадзяваліся на Яго.

21 І ўзялі яны статкі іхнія, вярблюдаў пяцьдзясят тысячаў, авечак дзьвесьце пяцьдзясят
тысячаў, аслоў дзьве тысячы і душаў людзкіх сто тысячаў.
22 Бо шмат пападала забітых, бо ад Бога была вайна гэтая. І жылі яны на месцы іхнім да няволі.
23 І сыны паловы калена Манасы жылі ў зямлі [гэтай], ад Башану аж да Баал-Гермону і Сэніру
і аж да гары Гермон; і яны множыліся.
24 І гэта галовы дамоў бацькоў іхніх: Этэр, Ішы, Эліэль, Азрыэль, Ірмэя, Гадавія і Яхдыэль,
ваяры мужныя, мужы слаўныя, галовы дамоў бацькоў сваіх.
25 І былі яны няверныя Богу бацькоў сваіх, і чужаложылі з багамі народаў зямлі гэтай, якіх Бог
вынішчыў перад абліччам іхнім.
26 І ўзбудзіў Бог Ізраіля дух Пула, валадара Асірыі, і дух Тыглат-Пільнэсэра, валадара Асірыі, і
ён высяліў іх, [сыноў] Рубэна і Гада, і палову калена Манасы, і завёў іх у Халах і Хавор, і Гару,
і да ракі Газон аж да сёньняшняга дня.

1 Лет 6

1 Сыны Левія: Гершом, Кегат і Мэрары.
2 Сыны Кегата: Амрам, Іцгар, Хеўрон і Узіэль.
3 Сыны Амрама: Аарон, Майсей і Мірыям. А сыны Аарона: Надаў, Абігу, Элеазар і Ітамар.
4 Элеазар нарадзіў Пінхаса; Пінхас нарадзіў Абішуа;
5 Абішуа нарадзіў Буккі; Буккі нарадзіў Узі;
6 Узі нарадзіў Зэрахію; Зэрахія нарадзіў Мэраёта;
7 Мэраёт нарадзіў Амарыю; Амарыя нарадзіў Ахітува;
8 Ахітуў нарадзіў Цадока; Цадок нарадзіў Ахімааца;
9 Ахімаац нарадзіў Азарыю; Азарыя нарадзіў Ёханана;
10 Ёханан нарадзіў Азарыю, таго, які быў сьвятаром у сьвятыні, якую пабудаваў Салямон у
Ерусаліме.
11 І нарадзіў Азарыя Амарыю; а Амарыя нарадзіў Ахітува;
12 Ахітуў нарадзіў Цадока; Цадок нарадзіў Шальлюма;
13 Шальлюм нарадзіў Хілкію; Хілкія нарадзіў Азарыю;
14 Азарыя нарадзіў Сэраю; Сэрая нарадзіў Егацадака.
15 Егацадак пайшоў у няволю, калі ГОСПАД аддаў Юду і Ерусалім у рукі Навухаданосара.
16 Сыны Левія: Гершом, Кегат і Мэрары.
17 І вось імёны сыноў Гершома: Ліўні і Шымэй.
18 Сыны Кегата: Амрам, Іцгар, Хеўрон і Узіэль.
19 Сыны Мэрары: Махлі і Мушы. І гэта сем'і Левія паводле бацькоў іхніх.
20 У Гершома: сын ягоны — Ліўні, сын ягоны — Яхат; сын ягоны — Зімма;
21 сын ягоны — Ёах; сын ягоны — Іддо; сын ягоны — Зэрах; сын ягоны — Еатэрай.
22 Сыны Кегата: сын ягоны — Амінадаў; сын ягоны — Карах; сын ягоны — Асір;
23 сын ягоны — Элькана; сын ягоны — Эвіясаф; сын ягоны — Асір;
24 сын ягоны — Тахат; сын ягоны — Урыэль; сын ягоны — Узія; сын ягоны — Шауль.
25 Сыны Эльканы: Амасай і Ахімот.
26 Сын ягоны — Элькана. Сыны Эльканы: сын ягоны — Цафай; сын ягоны — Нахат;
27 сын ягоны — Эліяў; сын ягоны — Ерахам; сын ягоны — Элькана.
28 Сыны Самуэля: першародны Вашні і Абія.
29 Сыны Мэрары: Махлі; сын ягоны — Ліўні; сын ягоны — Шымэй; сын ягоны — Уза;
30 сын ягоны — Шыма; сын ягоны — Хагія; сын ягоны — Асая.
31 Гэта тыя, якіх Давід паставіў для сьпяваньня ў Доме ГОСПАДА, як супачыў там Каўчэг.
32 І яны служылі сьпевам перад Сялібай Намёту Спатканьня, пакуль Салямон не пабудаваў
Дом ГОСПАДА ў Ерусаліме. І яны станавіліся на служэньне сваё паводле сем'яў сваіх.
33 Гэта тыя, што станавіліся [на служэньне], і сыны іхнія: з сыноў Кегата — Гэман сьпявак, сын
Ёэля, сына Самуэля,

34 сына Эльканы, сына Ерахама, сына Эліэля, сына Тааха,
35 сына Цуфа, сына Эльканы, сына Мааха, сына Амасая,
36 сына Эльканы, сына Ёэля, сына Азарыі, сына Цэфаніі,
37 сына Тахата, сына Асіра, сына Эвіясафа, сына Караха,
38 сына Іцгара, сына Кегата, сына Левія, сына Ізраіля.
39 І брат ягоны Асаф, які стаяў праваруч яго, — Асаф, сын Бэрэхіі, сына Шымэя,
40 сына Міхаэля, сына Баасэі, сына Малькіі,
41 сына Этні, сына Зэраха, сына Адаі,
42 сына Этана, сына Зіммы, сына Шымэя,
43 сына Яхата, сына Гершома, сына Левія.
44 А з сыноў Мэрары, братоў іхніх, леваруч: Этан, сын Кішы, сына Абадыі, сына Мальлюха,
45 сына Хашавіі, сына Амацыі, сына Хілкіі,
46 сына Амцы, сына Бані, сына Шамэра,
47 сына Махлі, сына Мушы, сына Мэрары, сына Левія.
48 А браты іхнія лявіты былі прызначаныя на ўсялякае служэньне пры сялібе Дому Божага.
49 А Аарон і сыны ягоныя складалі ахвяры на ахвярніку цэласпаленьня і на ахвярніку каджэньня, і [былі] да ўсякага служэньня ў Сьвятым Сьвятых, і дзеля перамольваньня за Ізраіля, паводле ўсяго, што загадаў Майсей, слуга Божы.
50 І гэта сыны Аарона: сын ягоны — Элеазар; сын ягоны — Пінхас; сын ягоны — Абішуя;
51 сын ягоны — Буккі; сын ягоны — Узі; сын ягоны — Зэрахія;
52 сын ягоны — Мэраёт; сын ягоны — Амарыя; сын ягоны — Ахітуў;
53 сын ягоны — Цадок; сын ягоны — Ахімаац.
54 І вось сядзібы іхнія паводле паселішчаў іхніх у межах іхніх. Сынам Аарона з сям'і Кегата, бо для іх было [гэтае] жэрабя,
55 далі Хеўрон у зямлі Юды і пашы ягоныя навокал яго.
56 А палі гораду гэтага і вёскі ягоныя далі Халеву, сыну Ефунны.
57 І вызначылі сынам Аарона гарады прыбежышча: Хеўрон, Лібну і пашы ейныя, Яттыр і Эштэмоа і пашы іхнія,
58 Хілез і пашы ягоныя, Дэвір і пашы ягоныя,
59 Ашан і пашы ягоныя, Бэт-Шэмэш і пашы ягоныя.
60 А з калена Бэн'яміна — Геву і пашы ейныя, Алемэт і пашы ягоныя, Анатот і пашы ягоныя; усіх гарадоў іхніх — трынаццаць гарадоў для сем'яў іхніх.
61 І сынам Кегата, якія засталіся з сем'яў калена гэтага, былі дадзены гарады з паловы калена, з калена Манасы жэрабям дзесяць гарадоў.
62 І сынам Гершома паводле сем'яў іхніх з калена Ісахара, і з калена Асэра, і з калена Нэфталі, і з калена Манасы ў Башане [дадзены] трынаццаць гарадоў.
63 Сынам Мэрары паводле сем'яў іхніх з калена Рубэна, і з калена Гада, і з калена Завулёна [дадзены] жэрабям дванаццаць гарадоў.
64 І далі сыны Ізраіля лявітам гарады і пашы іхнія.
65 І яны далі жэрабям з калена сыноў Юды і з калена сыноў Сымона, і з калена сыноў Бэн'яміна тыя гарады, якія яны назвалі імёнамі іхнімі.
66 І сем'і сыноў Кегата мелі гарады ў межах калена Эфраіма.
67 І далі ім гарады прыбежышча: Сыхем і пашы ягоныя на гары Эфраіма, Гезэр і пашы ягоныя,
68 Ёкмэам і пашы ягоныя, Бэт-Харон і пашы ягоныя,
69 Аялон і пашы ягоныя, Гат-Рымон і пашы ягоныя.
70 А з паловы калена Манасы: Анэр і пашы ягоныя, Білеам і пашы ягоныя [дадзеныя] сем'ям пазасталых сыноў Кегата.
71 Сынам Гершома [дадзена] з сем'яў паловы калена Манасы: Галан у Башане і пашы ягоныя, Аштарот і пашы ягоныя;
72 з калена Ісахара — Кедэш і пашы ягоныя, Даўрат і пашы ягоныя,
73 Рамот і пашы ягоныя, Анэм і пашы ягоныя;

74 з калена Асэра — Машал і пашы ягоныя, Абдон і пашы ягоныя,
75 Хукок і пашы ягоныя, Рэхоў і пашы ягоныя;
76 з калена Нэфталі — Кедэш у Галілеі і пашы ягоныя, Хамон і пашы ягоныя, Кірыятаім і пашы ягоныя.
77 Сынам Мэрары, якія засталіся, [дадзена] з калена Завулёна Рымон і пашы ягоныя, Табор і пашы ягоныя.
78 А на другім баку Ярдану, насупраць Ерыхону, на ўсходнім баку Ярдану [дадзены] ім з калена Рубэна Бэцэр у пустыні і пашы ягоныя, Ягца і пашы ейныя,
79 Кедэмот і пашы ягоныя, Мэфаат і пашы ягоныя;
80 з калена Гада — Рамот у Гілеадзе і пашы ягоныя, Маханаім і пашы ягоныя,
81 Хешбон і пашы ягоныя, Язэр і пашы ягоныя.

1 Лет 7

1 Сыны Ісахара: Тола, Пуа, Яшуў і Шымрон, чатыры.
2 Сыны Толы: Узі, Рэфая, Ерыэль, Яхмай, Іўсам і Самуэль, галовы дому бацькоў сваіх, [нашчадкі] Толы, ваяры мужныя. Паводле радаводаў іхніх лік іхні ў дні Давіда [быў] дваццаць дзьве тысячы шэсьцьсот.
3 Сыны Узі: Ізрахія; а сыны Ізрахіі: Міхаэль, Абадыя, Ёэль, Ішшыя, пяцёра; усе яны галоўныя.
4 І з імі, паводле радаводаў іхніх, паводле дамоў бацькоў іхніх, [былі] аддзелы ваяроў на вайну — трыццаць шэсьць тысячаў; бо яны мелі шмат жонак і сыноў.
5 І братоў іхніх, з усіх сем'яў Ісахара, ваяроў мужных было восемдзясят сем тысячаў, усіх, унесеных у сьпіс.
6 У Бэн'яміна: Бэла, Бэхер і Едыяэль, тры.
7 Сыны Бэлы: Ецбон, Узі, Узіэль, Ерымот і Іры, пяць, галовы дому бацькоў, ваяры мужныя. І было іх унесена ў сьпіс дваццаць дзьве тысячы трыццаць чатыры.
8 Сыны Бэхера: Зэміра, Ёаш, Эліэзэр, Элеаэнай, Амры, Ерэмот, Абія, Анатот і Алемэт. Усе гэтыя — сыны Бэхера.
9 І запісана іх, паводле радаводаў іхніх, галоваў дому бацькоў іхніх, ваяроў мужных — дваццаць тысячаў дзьвесьце.
10 Сыны Едыяэля: Більган. Сыны Більгана: Еуш, Бэн'ямін, Егуд, Хенаана, Зэтан, Таршыш і Ахішахар.
11 Усіх сыноў Едыяэля паводле галоваў [дому] бацькоў іхніх, ваяроў мужных— сямнаццаць тысячаў дзьвесьце, якія выходзілі войскам на вайну.
12 А Шуппім і Хуппім [былі] сынамі Іра; Хушым быў сынам Ахэра.
13 Сыны Нэфталі: Яхацээль, Гуні, Ецэр, Шальлюм, сыны Більгі.
14 Сыны Манасы: Асрыэль, якога нарадзіла наложніца ягоная Арамлянка. Яна ж нарадзіла Махіра, бацьку Гілеада.
15 І Махір узяў за жонку [сястру] Хуппіма і Шуппіма; і імя сястры іхняй — Мааха; а імя другога [сына] — Цэлафхад. І былі ў Цэлафхада дочкі.
16 І нарадзіла Мааха, жонка Махіра, сына, і назвала імя ягонае Пэрэш, а імя брата ягонага — Шэрэш; а сыны ягоныя — Улам і Рэкем.
17 Сыны Улама: Бэдан. Гэта сыны Гілеада, сына Махіра, сына Манасы.
18 А сястра ягоная Гаммалехет нарадзіла Ішгода, Абіэзэра і Махлю.
19 І былі сыны Шэміды: Ахіян, Шэхем, Лікхі і Аніям.
20 Сыны Эфраіма: Шутэлях, сын ягоны — Бэрэд, сын ягоны — Тахат, сын ягоны — Элеада, сын ягоны — Тахат,
21 сын ягоны — Завад, сын ягоны — Шутэлях, і Эзэр і Элеад. І забілі іх людзі Гату, народжаныя ў зямлі гэтай, бо яны зыйшлі захапіць статкі іхнія.
22 І плакаў па іх Эфраім, бацька іхні, шмат дзён, і прыйшлі браты ягоныя пацешыць яго.
23 І ўвайшоў ён да жонкі сваёй, і яна зачала, і нарадзіла сына, і ён назваў імя ягонае Бэрыя, бо гора прыйшло ў дом ягоны.
24 Дачка ягоная — Шээра. Яна пабудавала Бэт-Харон Ніжні і Верхні, і Уззэн-Шээру.

25 А сын ягоны — Рэфах, і Рэшэф, і сын ягоны — Тэлях, сын ягоны — Тахан,
26 сын ягоны — Лядан, сын ягоны — Амігуд, сын ягоны — Элішама,
27 сын ягоны — Нун, сын ягоны — Егошуа.
28 А ўласнасьць іхняя і сялібы: Бэтэль і вёскі ягоныя; на ўсходзе — Нааран, на захадзе — Гезэр
і вёскі ягоныя; Шэхем і вёскі ягоныя аж да Аі і вёсак ейных.
29 А ў руках сыноў Манасы [былі]: Бэт-Шэан і вёскі ягоныя, Таанах і вёскі ягоныя, Мэгіддо і
вёскі ягоныя, Дор і вёскі ягоныя. У іх жылі сыны Язэпа, сына Ізраіля.
30 Сыны Асэра: Імна, Ішва, Ішві, Бэрыя, і Сэрах, сястра іхняя.
31 Сыны Бэрыі: Хэвэр і Малькіэль. Ён — бацька Бірзаіта.
32 Хэвэр нарадзіў Яфлета, Шамэра, Хатама, і Шую, сястру іхнюю.
33 Сыны Яфлета: Пасах, Бімгал і Ашват. Гэта сыны Яфлета.
34 Сыны Шамэра: Ахі, Рохга, Хубба і Арам.
35 Сыны Гэлема, брата ягонага: Цафах, Імна, Шэлеш і Амаль.
36 Сыны Цафаха: Суах, Харнэфэр, Шуал, Бэры, Імра,
37 Бэцэр, Год, Шамма, Шылша, Ітран і Бээра.
38 Сыны Етэра: Ефунна, Піспа і Ара.
39 Сыны Ульлі: Арах, Ханніэль і Рыцыя.
40 Усе гэтыя — сыны Асэра, галавы дому бацькоў сваіх, выбраныя, ваяры мужныя, галоўныя з
князёў. І запісаны лік іхні як войска на вайне — дваццаць шэсьць тысячаў чалавек.

1 Лет 8

1 Бэн'ямін нарадзіў Бэлу, першароднага свайго, Ашбэл — другі, Ахрах — трэці,
2 Ноха — чацьвёрты, Рафа — пяты.
3 І былі сыны ў Бэлы: Аддар, Гера, Абігуд,
4 Абішуа, Нааман, Ахоах,
5 Гера, Шэфуфан, Хурам.
6 Вось сыны Егуды, яны — галовы дому бацькоў, якія жылі ў Геве і былі пераселеныя ў Манахат:
7 Нааман, Ахія, і Гера, які перасяліў іх і нарадзіў Уззу і Ахіхуда.
8 І Шахараім нарадзіў на палях Мааўскіх, пасьля таго, як адпусьціў ад сябе Хушыму і Баару,
жонак сваіх.
9 І нарадзіў ён ад Хадэш, жонкі сваёй, Ёвава, Цывію, Мэшу, Малькама,
10 Еуца, Шахію і Мірму. Гэта сыны ягоныя, галовы [дамоў] бацькоў.
11 А ад Хушымы ён нарадзіў Абітува і Эльпаала.
12 Сыны Эльпаала: Эвэр, Мішам, Шамэд, які пабудаваў Ону і Лёд з вёскамі ягонымі,
13 Бэрыя і Шэма. Яны — галовы [дамоў] бацькоў жыхароў Аялону. Яны выгналі жыхароў Гату.
14 А Ах'ё, Шашак, Ерэмот,
15 Завадыя, Арад, Адэр,
16 Міхаэль, Ішпа і Ёха — сыны Бэрыі.
17 А Зэвадыя, Мэшулям, Хізкі, Хавэр,
18 Ішмэрай, Ізлія і Ёваў — сыны Эльпаала.
19 А Якім, Зіхры, Заўды,
20 Эліэнай, Цылетай, Эліэль,
21 Адая, Бэрая і Шымрат — сыны Шымы.
22 А Ішпан, Эвэр, Эліэль,
23 Абдон, Зіхры, Ханан,
24 Хананія, Элям, Антотыя,
25 Іфдэя і Пэнуэль — сыны Шашака.
26 А Шамшэрай, Шэхарыя, Аталія,
27 Яарэшыя, Элія і Зіхры — сыны Ерахама.
28 Гэта галовы [дамоў] бацькоў паводле радаводаў сваіх, галоўныя. Яны жылі ў Ерусаліме.

29 А ў Гібэоне жылі: бацька Гібэона, і імя жонкі ягонай Мааха,
30 і сын ягоны першародны Абдон, і Цур, Кіш, Баал, Надаў,
31 Гедор, Ах'ё і Захер.
32 А Міклот нарадзіў Шымэя. І яны таксама жылі з братамі сваімі ў Ерусаліме насупраць братоў сваіх.
33 Нэр нарадзіў Кіша; Кіш нарадзіў Саўла; Саўл нарадзіў Ёнатана, Малькішуа, Абінадава і Эшбаала.
34 Сын Ёнатана — Мэрыб-Баал; Мэрыб-Баал нарадзіў Міху.
35 Сыны Міхі: Пітон, Мэлех, Тарэа і Ахаз.
36 Ахаз нарадзіў Егаяду; Егаяда нарадзіў Алемэта, Азмавэта і Зімры; Зімры нарадзіў Моцу;
37 Моца нарадзіў Бінэю; сын ягоны — Рафа; сын ягоны — Элеаса; сын ягоны — Ацэль.
38 У Ацэля [было] шэсьць сыноў, і вось імёны іхнія: Азрыкам, Бахеру, Ізмаэль, Шэарыя, Абадыя і Ханан. Усе яны — сыны Ацэля.
39 Сыны Эшэка, брата ягонага: Улам, першародны ягоны, Еуш — другі, Эліфэлет — трэці.
40 І былі сыны Улама людзьмі магутнымі, мужнымі, спраўнымі лучнікамі, і мелі яны шмат сыноў і сыноў сыноў сто пяцьдзясят. Усе яны — з сыноў Бэн'яміна.

1 Лет 9

1 І ўсе Ізраільцяне былі ўнесены ў сьпіс; і вось яны запісаныя ў кнігу валадароў Ізраіля і Юды, і былі пераселены ў Бабілон за правіны свае.
2 І яны жылі перш ва ўласнасьці сваёй у гарадах сваіх: Ізраільцяне, сьвятары, лявіты і нэтынэі.
3 У Ерусаліме жылі з сыноў Юды, з сыноў Бэн'яміна, з сыноў Эфраіма і Манасы:
4 Утай, сын Амігуда, сына Амры, сына Імры, сына Бані, з сыноў Пэрэса, сына Юды;
5 з [сыноў] Шылоні і Асая, першародны, і сыны ягоныя.
6 З сыноў Зэраха: Еўэль і браты іхнія, — шэсьцьсот дзевяноста.
7 З сыноў Бэн'яміна: Сальлю, сын Мэшуляма, сына Гадавіі, сына Хасэнуі;
8 і Іўнэя, сын Ерахама, і Эла, сын Узі, сына Міхры, і Мэшулям, сын Шэфатыі, сына Рэўэля, сына Іўнія,
9 і браты іхнія, паводле радаводаў іхніх — дзевяцьсот пяцьдзясят шэсьць. Усе гэтыя мужы — галовы [дому] бацькоў у доме бацькоў сваіх.
10 А са сьвятароў: Едая, Егаярыў і Яхін,
11 і Азарыя, сын Хілкіі, сына Мэшуляма, сына Цадока, сына Мэраёта, сына Ахітува, начальнік у Доме Божым,
12 і Адая, сын Ерахама, сына Пашхура, сына Малькіі, і Масая, сын Адыэля, сына Яхзэра, сына Мэшуляма, сына Мэшылеміта, сына Імэра,
13 і браты іхнія, галовы дому бацькоў сваіх — тысяча сямсот шэсьцьдзясят, магутныя, спрытныя ў працы служэньня ў Доме Божым.
14 А з лявітаў: Шэмая, сын Хашува, сына Азрыкама, сына Хашавіі, з сыноў Мэрары;
15 і Бакбакар, Хэрэш, Галял, Маттанія, сын Міхі, сына Зіхры, сына Асафа;
16 і Абадыя, сын Шэмаі, сына Галяла, сына Едутуна, і Бэрэхія, сын Асы, сына Эльканы, які жыў у вёсках Нэтафацянаў.
17 І прыдзьвернікі: Шальлюм, Акуў, Тальмон, Ахіман і браты іхнія; Шальлюм — галоўны,
18 і аж дагэтуль ён у браме валадарскай, якая на ўсход, яны — прыдзьвернікі паводле чаргі сыноў Левія.
19 Шальлюм, сын Карэ, сына Эвіясафа, сына Караха, і браты ягоныя з дому бацькі ягонага, Карахічы [былі] пры выкананьні служэньня, вартаўнікі парогаў Намёту, а бацькі іхнія былі пры табары ГОСПАДА вартаўнікамі ўваходу.
20 А Пінхас, сын Элеазара, уперад быў начальнікам над імі, і ГОСПАД быў з ім.
21 Захарыя, сын Мэшэлеміі — прыдзьвернік уваходу Намёту Спатканьня.

22 Усіх выбраных на прыдзьвернікаў у парогах [Намёту] — дзьвесьце дванаццаць. Яны
запісаныя ў сьпісе паводле радаводаў вёсак сваіх. Іх прызначыў Давід і Самуэль відушчы за
вернасьць іхнюю.
23 І яны, і сыны іхнія — прыдзьвернікі ГОСПАДА, пры доме Намёту, каб [быць] на варце.
24 Яны былі прыдзьвернікамі з чатырох бакоў: з усходу, з захаду, з поўначы і з поўдня.
25 А браты іхнія з вёсак сваіх мелі прыходзіць на сем дзён ад часу да часу, каб быць з імі;
26 бо за вернасьць былі гэтыя чатыры кіраўнікамі прыдзьвернікаў. Лявіты і яны былі над
каморамі і над скарбніцамі Дому Божага.
27 І каля Дому Божага яны начавалі, бо гэта вартаваньне было на іх, і яны адчынялі яго кожную
раніцу.
28 І [некаторыя] з іх былі [тыя, што] пры начыньнях для служэньня [Божага], бо яны пад лік
уносілі іх і выносілі іх.
29 І [некаторыя] з іх клапаціліся пра начыньні, пра ўсе начыньні сьвятыні, і пра муку, і віно, і
алей, і кадзіла, і пахошчы.
30 І з сыноў сьвятарскіх былі складальнікі масьцяў з пахошчаў.
31 Матытыя з лявітаў, першародны Шальлюма Карахіча, быў верным у прыгатаваньні печанага
[хлеба].
32 І з сыноў Кегата, з братоў іхніх былі [адказныя] за хлябы пакладныя, каб гатаваць іх кожную
суботу.
33 А сьпевакі, галовы [дамоў] бацькоў лявітаў, [якія жылі] ў пакоях варты начной, дзень і ноч
былі на служэньні сваім.
34 Гэта галовы [дамоў] бацькоў лявітаў паводле радаводаў сваіх. Гэтыя галовы [дамоў] жылі ў
Ерусаліме.
35 У Гібэоне жылі: бацька Гібэону Еэль, імя жонкі ягонай Мааха,
36 і сын ягоны, першародны Абдон, Цур, Кіш, Баал, Нэр, Надаў,
37 Гедор, Ах'ё, Захарыя і Міклот.
38 Міклот нарадзіў Шымеама. І яны насупраць братоў сваіх жылі ў Ерусаліме, разам з братамі
сваімі.
39 Нэр нарадзіў Кіша, Кіш нарадзіў Саўла, Саўл нарадзіў Ёнатана, Малькішуа, Абінадава і
Эшбаала.
40 Сын Ёнатана: Мэрыб-Баал; Мэрыб-Баал нарадзіў Міху.
41 Сыны Міхі: Пітон, Мэлех, Тахрэя.
42 Ахаз нарадзіў Яара; Яар нарадзіў Алемэта, Азмавэта і Зімры, Зімры нарадзіў Моцу;
43 Моца нарадзіў Бінэю; сын ягоны Рэфая; сын ягоны Элеаса, сын ягоны Ацэль.
44 У Ацэля [было] шэсьць сыноў, і вось імёны іхнія: Азрыкам, Бахеру, Ізмаэль, Шэарыя, Абадыя
і Ханан. Гэта сыны Ацэля.

1 Лет 10

1 І Філістынцы ваявалі з Ізраілем, і ўцяклі Ізраільцяне ад Філістынцаў, і падалі забітыя на гары
Гільбоа.
2 І атакавалі Філістынцы Саўла і сыноў ягоных, і забілі Філістынцы Ёнатана, Абінадава і
Малькішуа, сыноў Саўла.
3 І была цяжкая бітва з Саўлам, і знайшлі яго лучнікі, і ён быў паранены лучнікамі.
4 І сказаў Саўл збраяносцу свайму: «Выцягні меч твой і забі мяне ім, каб не прыйшлі гэтыя
неабрэзаныя і ня зьдзекваліся з мяне». Але збраяносец не адважыўся, бо вельмі спалохаўся. І
ўзяў Саўл меч, і ўпаў на яго.
5 І ўбачыў збраяносец, што Саўл памёр, і сам упаў на меч, і памёр.
6 І памёр Саўл, і тры сыны ягоныя разам з ім памерлі.
7 І ўбачылі ўсе людзі Ізраіля, якія былі ў даліне, што [ўсе] ўцякаюць, і што забітыя Саўл і сыны
ягоныя, і пакінулі яны гарады свае, і разьбегліся. І прыйшлі Філістынцы, і пасяліліся ў іх.
8 І сталася назаўтра, што прыйшлі Філістынцы рабаваць забітых, і знайшлі Саўла і сыноў
ягоных, забітых на гары Гільбоа.

9 І абрабавалі яго, і ўзялі галаву ягоную і зброю ягоную, і насілі па зямлі Філістынскай навокал,
каб паведаміць ідалам сваім і народу.
10 І палажылі зброю ягоную ў доме багоў сваіх, і чэрап ягоны зьмясьцілі ў доме Дагона.
11 І пачуў увесь Ябэш у Гілеадзе ўсё, што зрабілі Філістынцы Саўлу,
12 і ўсталі ўсе людзі мужныя, і забралі цела Саўла і целы сыноў ягоных, і прынесьлі іх у Ябэш,
і пахавалі косткі іхнія пад дубам у Ябэшы, і посьцілі сем дзён.
13 І памёр Саўл за правіну сваю, якою правініўся супраць ГОСПАДА, супраць слова ГОСПАДА,
якога ён не пільнаваў, і таксама за тое, што пытаўся ў чараўніцы, каб шукаць рады,
14 а не шукаў рады ў ГОСПАДА. І Ён усьмерціў яго, і перадаў валадарства Давіду, сыну Есэя.

1 Лет 11

1 І сабраўся ўвесь Ізраіль да Давіда ў Хеўрон, кажучы: «Вось, мы — косткі твае і цела тваё.
2 І ўчора, і пазаўчора, і за жыцьця Саўла валадара ты выводзіў і ўводзіў Ізраіль, і ГОСПАД,
Бог твой, сказаў табе: “Ты будзеш пасьвіць народ Мой, Ізраіль, і ты будзеш правадыром над
народам Маім Ізраілем”».
3 І прыйшлі ўсе старшыні Ізраіля да валадара ў Хеўрон, і заключыў Давід запавет у Хеўроне
перад абліччам ГОСПАДА; і яны памазалі Давіда на валадара над Ізраілем паводле слова
ГОСПАДА праз Самуэля.
4 І пайшоў Давід і ўвесь Ізраіль да Ерусаліму, гэта [значыць] Евусу. І там [былі] Евусэі, жыхары
зямлі той.
5 І сказалі жыхары Евусу Давіду: «Ты ня ўвойдзеш сюды». Але Давід здабыў крэпасьць Сыён,
гэта горад Давіда.
6 І сказаў Давід: «Той, хто першы паб’е Евусэяў, будзе галоўным і князем». І ўзыйшоў першым
Ёаў, сын Цэруі, і стаў галоўным.
7 І жыў Давід у крэпасьці, дзеля гэтага назвалі яе горадам Давіда.
8 І ён забудаваў горад навокал, ад Міло і навокал, а Ёаў аднавіў рэшту гораду.
9 І хадзіў Давід у моцы, і дужэў, і ГОСПАД Магуцьцяў [быў] з ім.
10 І вось галоўныя, якія [былі] з волатаў Давіда, і якія ўмацоўвалі з ім валадарства ягонае, з
усім Ізраілем, каб паставіць яго на валадара, паводле слова ГОСПАДА адносна Ізраіля.
11 І вось лік волатаў, якія [былі] з Давідам: Яшавэам, сын Хахмоні, галоўны з трыццаці. Ён
падняў дзіду сваю на тры сотні [ворагаў] і пабіў іх адным разам.
12 Пасьля яго Элеазар, сын Дадо Ахахіча. Ён — [адзін] з трох магутных.
13 Ён быў з Давідам у Пас-Даміме, і Філістынцы сабраліся там на вайну. І была частка поля
засеяна ячменем, і народ уцёк перад абліччам Філістынцаў.
14 І яны сталі пасярод поля, і абаранілі яго, і пабілі Філістынцаў. І збавіў ГОСПАД збаўленьнем
вялікім.
15 І зыйшлі трое з гэтых трыццаці галоўных на скалу да Давіда, у пячору Адулям, а табар
Філістынцаў быў у даліне Рэфаім.
16 Давід тады быў у крэпасьці, а аддзел Філістынцаў быў у Бэтлееме.
17 І засмагнуў Давід, і сказаў: «Хто дасьць мне піць вады са студні ў Бэтлееме, якая каля
брамы?»
18 І тады гэтыя тры прабіліся скрозь табар Філістынцаў, і зачэрпнулі са студні ў Бэтлееме, якая
каля брамы, і прынесьлі, і далі Давіду. І не захацеў Давід піць яе, і выліў яе для ГОСПАДА.
19 І сказаў: «Няхай будзе далёка ад мяне, Божа мой, каб я зрабіў гэта! Ці буду я піць кроў мужоў
гэтых, якія мелі ў небясьпецы душы свае? Бо з небясьпекай для душаў сваіх яны прынесьлі
[ваду]». І не захацеў яе піць. Вось што зрабілі гэтыя тры волаты.
20 І Абішай, брат Ёава, быў галоўны над трыма. Ён падняў дзіду сваю на тры сотні [ворагаў] і
пабіў [іх], і меў імя ў тых трох.
21 З трыццаці ён быў выдатнейшы, і быў іх правадыром; але першым тром не дараўняўся.
22 Бэная, сын Егаяды, сын мужа адважнага, [слаўнага] шматлікімі справамі, з Каўцээлю. Ён
перамог двух ільвоў Мааву; і ён зыйшоў, і забіў ільва ў яме ў дзень завеі.

23 І ён забіў Эгіпцяніна, чалавека, [які быў] ростам у пяць локцяў. У руцэ Эгіпцяніна была дзіда, як навой ткацкі; і ён выйшаў на яго з кіем, і вырваў дзіду з рукі Эгіпцяніна, і забіў яго дзідай ягонай.
24 Вось што зрабіў Бэная, сын Егаяды! І ён меў імя ў тых трох волатаў.
25 Ён быў слаўны сярод трыццаці, але тром не дараўняўся. І Давід паставіў яго над вартаю сваёй.
26 І магутныя з мужных: Асаэль, брат Ёава, Эльханан, сын Дадо з Бэтлеему;
27 Шамот з Гароры; Хэлец з Пэлоны;
28 Іра, сын Ікеша, з Тэкоа; Абіэзэр з Анатоту;
29 Сібэнай з Хушаты, Ілай з Ахохі,
30 Маграй з Нэтофы; Хэлед, сын Бааны, з Нэтофы;
31 Ітай, сын Рыбая, з Гівы сыноў Бэн'яміна; Бэная з Піратону;
32 Хурай з Нахале-Гааша; Абіэль з Арабаты;
33 Азмавэт з Бахурыму, Эліахба з Шаалвону;
34 сыны Гашэма з Гізону; Ёнатан, сын Шагэ, з Гарары;
35 Ахіям, сын Сахара, з Гарары; Эліфал, сын Ура;
36 Хэфэр з Мэхэры; Ахія з Пэлоны;
37 Хэцро з Кармэлю; Наарай, сын Эзбая;
38 Ёэль, брат Натана; Міўхар, сын Гагры;
39 Цэлек з Амону; Нахарай з Бэроту, збраяносец Ёава, сына Цэруі;
40 Іра з Етэру; Гарэў з Етэру;
41 Урыя Хет; Завад, сын Ахлая;
42 Адына, сын Шызы, Рубэніч, галава сыноў Рубэна, і з ім трыццаць;
43 Ханан, сын Маахі; Язафат з Мітні;
44 Узі з Аштароту; Шама і Еіэль, сыны Хафама з Араэру;
45 Едыяэль, сын Шымры, і Ёха, брат ягоны, з Тыцы;
46 Эліэль з Махавіму, Ерывай і Ёшавай, сыны Эльнаама; Ітма з Мааву;
47 Эліеэль, Абэд, Яасіэль з Мэцаваі.

1 Лет 12

1 А гэтыя прыйшлі да Давіда ў Цыкляг, [калі ён] хаваўся ад аблічча Саўла, сына Кіша, і былі яны сярод магутных, якія дапамагалі бітве,
2 [і былі яны] ўзброеныя лукам, праваю і леваю рукою [кідалі] камяні і стрэлы з луку, [і былі] з братоў Саўла, з [сыноў] Бэн'яміна:
3 галоўны — Ахіезэр, і Ёаш, сыны Шэмаі з Гівы; Езіэль і Пэлет, сыны Азмавэта; Бэраха і Егу з Анатоту;
4 Ішмая з Гібэону, магутны з трыццаці і над трыццацьцю; Ірмэя, Яхазіэль, Ёханан, Ёзавад з Гедэры;
5 Элюзай, Ерымот, Бэалія, Шэмарыя, Шэфатыя з Гаруфы;
6 Элькана, Ішыя, Азарэль, Ёезэр, Яшаба, [яны —] Карахічы;
7 Ёэла, Зэвадыя, сын Ерахаша, з Гедору.
8 І з [сыноў] Гада далучыліся да Давіда ў крэпасьці ў пустыні волаты, мужы адважныя, спраўныя да вайны, узброеныя шчытом і дзідаю; абліччы іхнія — як аблічча ільва, і як сарна на горах яны хуткія:
9 Езэр — галоўны, Абадыя — другі, Эліяў — трэці,
10 Мішманна — чацьвёрты, Ірмэя — пяты,
11 Атай — шосты, Эліэль — сёмы,
12 Ёханан — восьмы, Эльзавад — дзявяты,
13 Ірмэя — дзясяты, Махбанай — адзінаццаты.
14 Гэтыя з сыноў Гада былі галовамі войска: адзін з найменшых быў над сотняю, а найбольшы — над тысячаю.

15 Гэта тыя, якія перайшлі Ярдан у першы месяц, калі ён перапоўнены па-над берагі свае, і
разагналі ўсіх, што жылі ў далінах на ўсходзе і на захадзе.
16 І прыйшлі [людзі] з сыноў Бэн'яміна і Юды ў крэпасьць да Давіда.
17 І выйшаў Давід перад аблічча іхняе, і адказаў, і сказаў ім: «Калі з супакоем вы прыйшлі да
мяне, каб дапамагчы мне, няхай будзе ў мяне з вамі адно сэрца; а калі дзеля таго, каб здрадліва
аддаць мяне ворагам маім, хоць няма няправасьці ў руках маіх, няхай убачыць Бог бацькоў
нашых і няхай рассудзіць».
18 І Дух агарнуў Амасаю, галаву трыццаці, [і ён сказаў]: «Супакой табе, Давідзе, і з табою, сыне
Есэя! Супакой табе і супакой памочніку твайму, бо дапамагае табе Бог твой». І прыняў іх
Давід, і паставіў іх на чале аддзелаў.
19 І з [сыноў] Манасы далучыліся да Давіда, калі ён ішоў з Філістынцамі на вайну супраць Саўла,
але не дапамагаў ім, бо князі Філістынскія, парадзіўшыся, адаслалі яго, кажучы: «Коштам
галоваў нашых ён пяройдзе да гаспадара свайго Саўла».
20 Калі ён ішоў у Цыкляг, далучыліся да яго з Манасы: Аднах, Ёзавад, Едыяэль, Міхаэль, Ёзавад,
Елігу і Цылетай, — тысячнікі ў Манасы.
21 І яны дапамагалі Давіду супраць арды, бо ўсе яны былі магутнымі і мужнымі і былі князямі
ў войску.
22 Гэтак кожны дзень прыходзілі да Давіда, каб дапамагаць яму, ажно табар ягоны стаў
вялікім, як табар Божы.
23 І гэта лік галоваў [дамоў], узброеных да вайны, якія прыйшлі да Давіда ў Хеўрон, каб
перадаць яму валадарства Саўла, паводле слова ГОСПАДА.
24 Сыны Юды, якія носяць шчыт і дзіду — шэсьць тысячаў васемсот узброенага войска.
25 З сыноў Сымона магутных і мужных у войску — сем тысячаў сто.
26 З сыноў Левія — чатыры тысячы шэсьцьсот,
27 і Егаяда, правадыр [сыноў] Аарона, і з ім тры тысячы сямсот,
28 і Цадок, дзяцюк магутны, мужны, і дом бацькоў ягоных, дваццаць два князі.
29 З сыноў Бэн'яміна, братоў Саўла, — тры тысячы, але дагэтуль большасьць іх моцна служылі
дому Саўла.
30 З сыноў Эфраіма — дваццаць тысячаў васемсот людзей мужных, магутных, [якія маюць]
імёны ў доме бацькоў сваіх.
31 З паловы калена Манасы — васемнаццаць тысячаў, якія названыя былі па імёнах, каб пайсьці
паставіць Давіда за валадара.
32 З сыноў Ісахара, тых, якія мелі разуменьне часу і ведалі, што мае рабіць Ізраіль, — дзьвесьце
галоўных, і ўсе браты іхнія ішлі за словам іхнім.
33 З [сыноў] Завулёна, тых, якія выходзілі ў войска, гатовыя на вайну, з усялякімі ваеннымі
прыладамі — пяцьдзясят тысячаў, пашыхтаваных і непахіснага сэрца;
34 З [сыноў] Нэфталі — тысяча князёў; з імі — трыццаць сем тысячаў са шчытамі і дзідамі.
35 З [сыноў] Дана гатовых да бітвы — дваццаць восем тысячаў шэсьцьсот.
36 З [сыноў] Асэра тых, якія выходзілі ў войска, гатовыя на вайну — сорак тысячаў.
37 З таго боку Ярдану з [сыноў] Рубэна, Гада і паловы калена Манасы, з усякімі прыладамі для
бітвы — сто дваццаць тысячаў.
38 Усе гэтыя ваяры, якія маглі трымаць шыхт з непахісным сэрцам, прыйшлі ў Хеўрон, каб
паставіць Давіда за валадара над усім Ізраілем. І таксама ўся рэшта Ізраіля мела адно сэрца,
каб паставіць Давіда за валадара.
39 І яны былі ў Давіда там тры дні, елі і пілі, бо браты іхнія прыгатавалі для іх.
40 І таксама бліжнія іхнія, нават ад Ісахара, Завулёна і Нэфталі, прывозілі хлеб на аслах, на
вярблюдах, на мулах і на валах, ежу, муку, фігі, разынкі, віно, алей, валоў і авечак мноства, бо
радасьць [была] ў Ізраілі.

1 Лет 13

1 І радзіўся Давід з тысячнікамі, сотнікамі, з усімі правадырамі.

2 І сказаў Давід усёй царкве Ізраіля: «Калі гэта для вас добра і калі гэта ад ГОСПАДА, Бога
нашага, пашлем паўсюль да пазасталых братоў нашых па ўсёй зямлі Ізраіля, і да сьвятароў
і лявітаў у гарадах і паселішчах іхніх, каб яны сабраліся да нас.
3 І перанясем да нас Каўчэг Бога нашага, бо мы не пыталіся пра яго ў дні Саўла».
4 І сказала ўся царква, каб зрабіць так, бо слушнай была справа гэтая ў вачах усяго народу.
5 І сабраў Давід увесь Ізраіль, ад Шыхору Эгіпецкага аж да ўваходу ў Хамат, каб перанесьці
Каўчэг Божы з Кірыят-Ярыму.
6 І зыйшоў Давід і ўвесь Ізраіль да Баалу ў Кірыят-Ярыме, які ў Юдзе, каб прынесьці адтуль
Каўчэг Бога, ГОСПАДА, Які сядзіць на херувімах, на якім названае імя [Ягонае].
7 І павезьлі Каўчэг Божы на новым возе з дому Абінадава, і Уза і Ах'ё вялі воз.
8 А Давід і ўвесь Ізраіль гралі перад Богам з усёй сілы са сьпевамі, на гусьлях, на псалтырах, на
бубнах, на цымбалах і на трубах.
9 І яны прыйшлі да току Кідона, і выцягнуў Уза руку сваю, каб падтрымаць Каўчэг, бо валы
нахілілі яго.
10 І загневаўся ГОСПАД на Узу, і Ён забіў яго за тое, што ён выцягнуў руку сваю да Каўчэгу, і ён
памёр там перад абліччам Божым.
11 І засмуціўся Давід, што ГОСПАД ударам ударыў Узу, і назваў тое месца Пэрэц-Уза аж да
гэтага дня.
12 І спалохаўся Давід Бога ў гэты дзень, кажучы: «Як я прынясу да сябе Каўчэг Божы?»
13 І не прынёс Давід Каўчэг да сябе, у горад Давіда, а зьмясьціў яго ў доме Абэд-Эдома з Гату.
14 І быў Каўчэг Божы ў Абэд-Эдома, у доме ягоным, тры месяцы, і дабраславіў ГОСПАД дом
Абэд-Эдома і ўсё, што ў яго.

1 Лет 14

1 І паслаў Хірам, валадар Тыру, да Давіда паслоў, і дрэвы кедровыя, і муляроў, і цесьляроў, каб
будаваць яму дом.
2 І даведаўся Давід, што ГОСПАД умацаваў яго як валадара над Ізраілем, бо высока
ўзьвялічылася валадарства ягонае дзеля народу Ягонага Ізраіля.
3 І ўзяў Давід яшчэ жонак у Ерусаліме, і нарадзіў Давід яшчэ сыноў і дочак.
4 І вось імёны тых, якія нарадзіліся ў яго ў Ерусаліме: Шамуа, Шаваў, Натан і Салямон,
5 Іўхар, Элішуа, Эльпалет,
6 Нагах, Нэфэг, Яфія,
7 Элішама, Бээляда і Эліфэлет.
8 І пачулі Філістынцы, што Давід памазаны як валадар над усім Ізраілем, і выйшлі ўсе
Філістынцы шукаць Давіда. І пачуў Давід, і выйшаў перад аблічча іхняе.
9 І Філістынцы прыйшлі, і азлажылі [табар] у даліне Рэфаім.
10 І спытаўся Давід у Бога, кажучы: «Ці вырушыць мне супраць Філістынцаў, і ці Ты аддасі іх у
рукі мае?» І сказаў яму ГОСПАД: «Руш, і Я аддам іх у рукі твае».
11 І пайшлі яны ў Баал-Пэрацым, і пабіў іх там Давід, і сказаў Давід: «Пабіў Бог ворагаў маіх
рукою маёю, як прарыў вады». Дзеля гэтага далі імя месцу гэтаму Баал-Пэрацым.
12 І пакінулі там Філістынцы багоў сваіх, і загадаў Давід, і спалілі [іх] у агні.
13 І сабраліся зноў Філістынцы, і разлажылі [табар] у даліне.
14 І зноў спытаў Давід у Бога, і сказаў яму Бог: «Не выходзь на іх, ухіліся ад іх і ідзі на іх з боку
тутавых дрэваў.
15 Калі пачуеш гук крокаў на вершалінах дрэваў, тады выйдзі на бітву, бо выйшаў Бог перад
абліччам тваім, каб пабіць табар Філістынскі».
16 І зрабіў Давід, як загадаў яму Бог; і пабілі табар Філістынскі ад Гібэону аж да Гэзэры.
17 І было праслаўлена імя Давіда па ўсіх землях, і ГОСПАД спаслаў страх Свой на ўсе народы.

1 Лет 15

1 І пабудаваў [Давід] сабе дамы ў горадзе Давіда, і падрыхтаваў месца для Каўчэгу Божага, і
расьцягнуў для яго намёт.
2 Тады сказаў Давід: «Ніхто ня мае насіць Каўчэг Божы, акрамя лявітаў, бо іх выбраў ГОСПАД
на тое, каб насіць Каўчэг Божы і служыць пры ім на вякі».
3 І сабраў Давід усяго Ізраіля ў Ерусалім, каб прынесьці Каўчэг ГОСПАДА на месца ягонае, якое
ён прыгатаваў для яго.
4 І сабраў Давід сыноў Аарона і лявітаў.
5 З сыноў Кегата: Урыэля, начальніка, і братоў ягоных — сто дваццаць;
6 з сыноў Мэрары: Асію, начальніка, і братоў ягоных — дзьвесьце дваццаць;
7 з сыноў Гершома: Ёэля, начальніка, і братоў ягоных — сто трыццаць;
8 з сыноў Эліцафана: Шэмаю, начальніка, і братоў ягоных — дзьвесьце;
9 з сыноў Хеўрона: Эліэля, начальніка, і братоў ягоных — восемдзясят;
10 з сыноў Узіэля: Амінадава, начальніка, і братоў ягоных — сто дванаццаць.
11 І паклікаў Давід Цадока і Абіятара, сьвятароў, і лявітаў Урыэля, Асаю, Ёэля, Шэмаю, Эліэля і
Амінадава,
12 і сказаў ім: «Вы — галовы [дамоў] бацькоў у лявітаў. Асьвяціцеся вы і браты вашыя і
перанясіце Каўчэг ГОСПАДА, Бога Ізраіля, на месца, якое я прыгатаваў для яго.
13 Бо першы раз ня вы гэта рабілі, і ГОСПАД, Бог наш, ударыў нас, бо мы не шукалі Яго як мае
быць».
14 І асьвяціліся сьвятары і лявіты, каб перанесьці Каўчэг ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
15 І несьлі сыны лявітаў Каўчэг Божы, як загадаў Майсей паводле слова ГОСПАДА, на рамёнах
сваіх, на насілах.
16 І сказаў Давід начальнікам лявітаў, каб паставілі братоў сваіх сьпевакоў з музычнымі
інструмэнтамі, з псалтырамі, гусьлямі, цымбаламі, каб гралі, падымаючы голас з радасьцю.
17 І паставілі лявіты Гэмана, сына Ёэля, і з братоў ягоных Асафа, сына Бэрэхіі, а з сыноў
Мэрары, братоў іхніх, Этана, сына Кушаі,
18 і з імі братоў іхніх другога шэрагу: Захарыю, Бэна, Яазіэля, Шэмірамота, Ехіэля, Уні, Эліява,
Бэнаю, Маасэю, Матытыю, Элефэлегу, Мікнэю, Абэд-Эдома, Еіэля, прыдзьвернікаў.
19 І сьпевакоў: Гэмана, Асафа і Этана — з цымбаламі мядзянымі, каб чулі;
20 а Захарыю, Азіэля, Шэмірамота, Ехіэля, Уні, Эліява, Маасэю, Бэнаю — з псалтырамі;
21 а Матытыю, Эліфэлегу, Мікнэю, Абэд-Эдома, Еіэля і Азазію — з гусьлямі на актаву для
пачынаньня.
22 А Хэнанію, начальніка лявітаў у сьпеве, — каб кіраваў сьпяваньнем, бо ён быў здольны [ў
гэтым].
23 А Бэрэхія і Элькана былі вартаўнікамі пры Каўчэгу.
24 А Шэванія, Язафат, Нэтанэль, Амасай, Захарыя, Бэная і Эліэзэр, сьвятары, трубілі ў трубы
перад Каўчэгам Божым. Абэд-Эдом і Ехія былі вартаўнікамі пры Каўчэгу.
25 І сталася, што Давід і старшыні Ізраіля, і тысячнікі вырушылі, каб вынесьці Каўчэг Запавету
ГОСПАДА з дому Абэд-Эдома з радасьцю.
26 І сталася, што Бог дапамог лявітам, якія несьлі Каўчэг Запавету ГОСПАДА, і склалі ў ахвяру
сем бычкоў і сем бараноў.
27 І Давід быў апрануты ў плашч з вісону, [таксама] і ўсе лявіты, якія несьлі Каўчэг і сьпявалі,
і Хэнанія, начальнік сьпяваньня сьпевакоў. І на Давідзе быў эфод ільняны.
28 І ўвесь Ізраіль узьняў Каўчэг Запавету ГОСПАДА з гуканьнем і з гукам рагоў, і з трубамі, і з
цымбаламі, граючы на псалтырах і гусьлях.
29 І сталася, калі Каўчэг Запавету ГОСПАДА ўваходзіў у горад Давіда, Міхаль, дачка Саўла,
глядзела ў вакно, і ўбачыла валадара Давіда, які скакаў і танчыў, і пагардзіла ім у сэрцы сваім.

1 Лет 16

1 І прынесьлі Каўчэг Божы, і паставілі яго ў сярэдзіне Намёту, які Давід падрыхтаваў для яго, і

склалі ахвяры цэласпаленьня і ахвяры мірныя перад абліччам Божым.
2 І скончыў Давід паліць цэласпаленьні і ахвяры мірныя, і дабраславіў народ у імя ГОСПАДА.
3 І раздаў усім Ізраільцянам, як мужчынам, так і жанчынам, кожнаму па бохану хлеба, і па
кавалку мяса, і па кілішку віна.
4 І паставіў на службу перад Каўчэгам ГОСПАДА на служэньне лявітаў, каб нагадвалі [пра Яго],
славілі і хвалілі ГОСПАДА, Бога Ізраіля:
5 Асаф — галоўны, і намесьнік ягоны Захарыя, Еіэль, Шэмірамот, Ехіэль, Матытыя, Эліяў,
Баная, Абэд-Эдом і Еіэль з псалтырам і гусьлямі, Асаф — на цымбалах гучных,
6 Бэная і Яхазіэль, сьвятары — заўсёды [трубіць] у трубы перад Каўчэгам Запавету Божага.
7 У той дзень Давід упершыню загадаў славіць ГОСПАДА Асафу і братам ягоным:
8 «Слаўце ГОСПАДА, клічце імя Ягонае, паведамляйце між народамі дзеі Ягоныя!
9 Сьпявайце Яму, выслаўляйце Яго, размаўляйце пра ўсе цудоўныя дзеі Ягоныя.
10 Хваліцеся імем Ягоным сьвятым! Няхай весяліцца сэрца тых, што шукаюць ГОСПАДА.
11 Шукайце ГОСПАДА і сілу Ягоную, шукайце аблічча Ягонае заўсёды.
12 Узгадвайце цудоўныя дзеі Ягоныя, якія Ён зрабіў, цуды Ягоныя і прысуды вуснаў Ягоных.
13 Насеньне Ізраіля, слугі Ягоныя, сыны Якуба, выбранцы Ягоныя!
14 Ён — ГОСПАД, Бог наш; па ўсёй зямлі суды Ягоныя.
15 Ён памятае на вякі Запавет Свой, слова, якое загадаў на тысячу пакаленьняў,
16 якое заключыў з Абрагамам, і прысягу Сваю Ісааку.
17 Ён паставіў Якубу як пастанову, Ізраілю — запавет вечны,
18 кажучы: “Табе Я дам зямлю Ханаан, [пракладу] шнур спадчыны вашай”.
19 Калі было ў вас людзей мала на лік, вельмі мала і [вы былі] чужынцы ў ёй,
20 і пераходзілі ад народу да народу, і ад [аднаго] валадарства да іншага народу,
21 Ён не дазволіў нікому прыгнятаць іх, і караў дзеля іх валадароў:
22 [кажучы]: “Не чапайце памазанцаў Маіх, і прарокам Маім не рабіце благога!”
23 Сьпявайце ГОСПАДУ, уся зямля, дабравесьціце з дня на дзень збаўленьне Ягонае.
24 Абвяшчайце між народамі славу Ягоную, між усімі людзьмі — цуды Ягоныя.
25 Бо вялікі ГОСПАД і годны хвалы, годны страху больш за ўсіх багоў.
26 Бо ўсе богі народаў — ідалы, а ГОСПАД нябёсы ўчыніў.
27 Слава і велічнасьць перад абліччам Ягоным, моц і краса — на месцы Ягоным.
28 Аддайце ГОСПАДУ, плямёны народаў, аддайце ГОСПАДУ славу і моц.
29 Аддайце ГОСПАДУ славу імя Ягонага. Прынясіце дары і ідзіце перад аблічча Ягонае.
Пакланіцеся ГОСПАДУ ў велічы сьвятыні.
30 Дрыжы перад абліччам Ягоным, уся зямля. Ён сусьвет умацаваў, не пахісьнецца.
31 Няхай узрадуюцца нябёсы, няхай узьвесяліцца зямля, і няхай скажуць між народамі:
“ГОСПАД валадарыць!”
32 Няхай мора гудзе і тое, што ў ім, няхай усьцешыцца поле і ўсё, што на ім.
33 Тады будуць усклікаць дрэвы лясныя перад абліччам ГОСПАДА, бо Ён прыходзіць судзіць
зямлю.
34 Выслаўляйце ГОСПАДА, бо Ён добры, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная.
35 І кажыце: “Збаў нас, Божа збаўленьня нашага! І зьбяры нас, і выбаў нас ад паганаў, каб мы
маглі славіць імя Тваё сьвятое і хваліліся славай Тваёй!”
36 Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, ад веку і аж на вякі!» І сказаў увесь народ: «Амэн!», і
славіў ГОСПАДА.
37 І [Давід] пакінуў там, перад Каўчэгам Запавету ГОСПАДА, Асафа і братоў ягоных, каб яны
служылі перад Каўчэгам заўсёды, паводле патрэбы кожнага дня,
38 і Абэд-Эдома і братоў ягоных, шэсьцьдзясят восем; а Абэд-Эдома, сына Едутуна, і Хосу
прыдзьвернікамі,
39 а Цадока, сьвятара, і братоў ягоных, сьвятароў — перад Сялібай ГОСПАДА, на ўзгорку, які ў
Гібэоне,

40 каб складалі цэласпаленьні ГОСПАДУ на ахвярніку цэласпаленьня заўсёды, раніцаю і
ўвечары, паводле ўсіх пастановаў Закону ГОСПАДА, які Ён загадаў Ізраілю.
41 І з імі Гэмана і Едутуна і іншых выбраных, якія прызначаныя па імёнах, каб славіць ГОСПАДА,
бо на вякі міласэрнасьць Ягоная.
42 Пры іх Гэман і Едутун з трубамі і цымбаламі, каб граць, і з інструмэнтамі для сьпеваў Божых;
а сыны Едутуна — пры браме.
43 І адыйшоў увесь народ, кожны ў дом свой, і вярнуўся Давід, каб дабраславіць дом свой.

1 Лет 17

1 І сталася, калі Давід жыў у доме сваім, сказаў Давід Натану прароку: «Вось, я жыву ў доме
кедровым, а Каўчэг Запавету ГОСПАДА пад заслонамі [намёту]».
2 І сказаў Натан Давіду: «Усё, што ў сэрцы тваім, рабі, бо Бог з табою».
3 І сталася ў тую ноч, і было слова Божае да Натана, кажучы:
4 «Ідзі і скажы Давіду, слузе Майму: “Гэтак кажа ГОСПАД. Ня ты збудуеш Мне дом, каб Я жыў
[у ім].
5 Бо Я ня жыў у доме ад дня, калі вывеў сыноў Ізраіля, і да дня гэтага, і Я пераходзіў з намёту
ў намёт, і з сялібы [ў сялібу].
6 І ўсюды, дзе Я хадзіў па ўсім Ізраілі, ці сказаў Я слова аднаму з судзьдзяў Ізраіля, якім Я
загадаў пасьвіць народ Мой, кажучы: “Дзеля чаго вы не пабудавалі Мне дом кедровы?”
7 І цяпер гэтак скажы слузе Майму Давіду: “Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Я ўзяў цябе ад
абораў, калі ты хадзіў за авечкамі, каб ты стаў правадыром над народам Маім, Ізраілем.
8 І Я быў з табою ўсюды, куды ты хадзіў, і Я выгубіў усіх ворагаў тваіх перад абліччам тваім, і
зрабіў табе імя, як імя вялікіх на зямлі.
9 І Я прыгатаваў месца для народу Майго, Ізраіля, і пасадзіў іх, і яны будуць жыць на месцы
сваім, і ня будуць палохаць іх болей, і ня будуць перасьледаваць іх сыны нягоднасьці, каб
вынішчаць іх, як [было] ўперад,
10 у той час, калі Я прызначаў судзьдзяў над народам Маім, Ізраілем. І Я скарыў усіх ворагаў
тваіх, і абвяшчаю табе, што ГОСПАД збудуе табе дом.
11 І станецца, калі напоўняцца дні твае, каб ты пайшоў да бацькоў тваіх, Я падыму насеньне
тваё пасьля цябе, якое будзе з сыноў тваіх, і ўмацую валадарства ягонае.
12 Ён пабудуе Мне дом, і Я ўмацую пасад ягоны на вякі.
13 І Я буду яму Бацькам, а ён будзе Мне сынам, і міласэрнасьці Маёй не забяру ад яго, як Я
забраў ад таго, які быў перад табою.
14 І Я пастаўлю яго ў доме Маім і ў валадарстве Маім на вякі, і пасад ягоны будзе трываць на
вякі”».
15 Паводле ўсіх гэтых словаў і паводле ўсяго гэтага відзежу прамаўляў Натан да Давіда.
16 І прыйшоў валадар Давід, і сеў перад абліччам ГОСПАДА, і сказаў: «Хто я, ГОСПАДЗЕ Божа, і
хто дом мой, што Ты прывёў мяне аж сюды?
17 Але і гэтага мала было ў вачах Тваіх, Божа; і Ты прамовіў пра дом слугі Твайго на доўгія
часы, і глянуў на мяне, як на чалавека ўзьвялічанага, ГОСПАДЗЕ!
18 Што яшчэ можа дадаць Табе Давід за ўслаўленьне слугі Твайго? Ты ведаеш слугу Твайго.
19 ГОСПАДЗЕ! Дзеля слугі Твайго і паводле сэрца Твайго Ты ўчыніў усе гэтыя [справы] вялікія,
каб выявілася ўся вялікасьць [Твая].
20 ГОСПАДЗЕ! Няма нікога, як Ты, і няма Бога, апрача Цябе, [Які зрабіў] усё, што мы чулі вушамі
сваімі.
21 І хто як народ Твой, Ізраіль, адзіны народ на зямлі, да якога прыйшоў Бог, каб выкупіць Сабе
народ і зрабіць Сабе імя вялікімі і страшнымі справамі, выгнаўшы паганаў перад абліччам
народу Свайго, які Ты выкупіў з Эгіпту?
22 І Ты зрабіў народ Твой, Ізраіля, народам Сваім на вякі, і Ты, ГОСПАДЗЕ, стаў для іх Богам.
23 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, слова, якое Ты прамовіў пра слугу Твайго і пра дом ягоны, няхай будзе
верным на вякі, і зрабі так, як Ты прамовіў.

24 Няхай станецца верным і вялікім імя Тваё на вякі, каб казалі: “ГОСПАД Магуцьцяў, Бог
Ізраіля — гэта Бог над Ізраілем”. І дом Давіда, слугі Твайго, няхай будзе ўмацаваны перад
абліччам Тваім.
25 Бо Ты, Божа мой, адкрыў у вуха слузе Твайму, што Ты пабудуеш яму дом. Дзеля гэтага
адважыўся слуга Твой маліцца перад абліччам Тваім.
26 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, Ты — Бог, і Ты сказаў пра слугу Твайго столькі добрага.
27 І цяпер пачні дабраслаўляць дом слугі Твайго, каб ён быў вечна перад абліччам Тваім, бо
Ты, ГОСПАДЗЕ, дабраславіў [яго], і ён будзе дабраслаўлёны на вякі».

1 Лет 18

1 І сталася пасьля гэтага, што Давід разьбіў Філістынцаў, і ўпакорыў іх, і ўзяў Гат і вёскі ягоныя
з рукі Філістынцаў.
2 І разьбіў ён Мааўлянаў, і сталі Мааўляне слугамі Давіда, даючы яму дары.
3 І разьбіў Давід Гададэзэра, валадара Цовы, у Хамаце, калі той ішоў, каб умацаваць уладу сваю
над ракою Эўфрат.
4 І ўзяў Давід у яго тысячу калясьніцаў, сем тысячаў коньнікаў і дваццаць тысячаў пяхотнікаў,
і падрэзаў Давід жылы ўсім [коням] калясьнічным, і пакінуў з іх на сто калясьніцаў.
5 І прыйшоў Арам з Дамаску на дапамогу Гададэзэру, валадару Цовы, і разьбіў Давід у Арама
дваццаць дзьве тысячы чалавек.
6 І паставіў Давід [залогу] ў Арама ў Дамаску, і Арамляне сталі слугамі Давіда, прыносячы
[яму] дары. І ГОСПАД дапамагаў Давіду паўсюль, дзе ён хадзіў.
7 І ўзяў Давід шчыты залатыя, якія былі ў слугаў Гададэзэра, і прынёс іх у Ерусалім.
8 А з Тыўхаты і Зуну, гарадоў Гададэзэра, узяў Давід вельмі шмат медзі. З яе Салямон зрабіў
мора мядзянае, і слупы, і начыньне мядзянае.
9 І пачуў Тоў, валадар Хамату, што Давід разьбіў усё войска Гададэзэра, валадара Цовы.
10 І паслаў Гадарама, сына свайго, да валадара Давіда, каб запытацца пра супакой, і каб
дабраславіць яго за тое, што ён ваяваў з Гададэзэрам і разьбіў яго, бо Тоў вёў вайну з
Гададэзэрам, і [ён паслаў] усялякія начыньні залатыя, срэбныя і мядзяныя.
11 Таксама гэтае начыньне пасьвяціў валадар Давід для ГОСПАДА разам са срэбрам і золатам,
якое ён узяў у-ва ўсіх народаў, у Эдома, у Маава, у сыноў Амона, у Філістынцаў і Амалека.
12 І Абішай, сын Цэруі, разьбіў Эдамлянаў у Саляной даліне, васямнаццаць тысячаў;
13 І паставіў ён залогі ў Эдоме, і стаў увесь Эдом слугамі Давіда. І дапамагаў ГОСПАД Давіду
паўсюль, дзе ён хадзіў.
14 І валадарыў Давід над усім Ізраілем, і чыніў суд і праведнасьць усяму народу свайму.
15 Ёаў, сын Цэруі, [быў] над войскам, Язафат, сын Ахілюда — канцлер,
16 Цадок, сын Ахітува, і Абімэлех, сын Абіятара — сьвятары, Шаўша — пісар,
17 Бэная, сын Егаяды — над Керэтамі і Пэлетамі; а сыны Давіда — першыя пры валадары.

1 Лет 19

1 І сталася пасьля гэтага, і памёр Нахаш, валадар сыноў Амона, і заваладарыў сын ягоны пасьля
яго.
2 І сказаў Давід: «Зьяўлю міласэрнасьць Хануну, сыну Нахаша, бо бацька ягоны зьявіў мне
міласэрнасьць». І паслаў Давід пасланцоў пацешыць яго па бацьку ягоным. І прыйшлі слугі
Давіда ў зямлю сыноў Амона да Хануна, каб пацешыць яго.
3 І сказалі князі сыноў Амона Хануну: «Ці Давід шануе бацьку твайго ў вачах тваіх, што ён
прыслаў пацяшыцеляў да цябе? Ці ня дзеля таго, каб высачыць і зьнішчыць, і выведаць зямлю
прыйшлі слугі ягоныя да цябе?»
4 І ўзяў Ханун слугаў Давіда, і пагаліў іх, і абрэзаў адзеньне іхняе напалову, да азадкаў, і
адпусьціў іх.
5 І прыйшлі яны, і паведамілі Давіду пра людзей гэтых. І ён паслаў ім насустрач, бо яны былі
вельмі асаромленыя. І сказаў валадар: «Застаньцеся ў Ерыхоне, пакуль адрастуць бароды
вашыя, і тады вернецеся».

6 І ўбачылі сыны Амона, што яны сталі ненавісныя Давіду, і паслаў Ханун і сыны Амона тысячу
талентаў срэбра, каб наняць сабе калясьніцы і вершнікаў з Арам-Нагараіму, і з Арам-Маахі, і з
Цовы.
7 І яны нанялі сабе трыццаць дзьве тысячы калясьнічнікаў і валадара Маахі, і народ ягоны. І
яны прыйшлі, і паставілі [намёты] перад абліччам Мэдэвы. І сыны Амона сабраліся з гарадоў
сваіх, і прыйшлі на бітву.
8 І пачуў Давід, і паслаў Ёава з усім войскам волатаў.
9 І вырушылі сыны Амона, і пашыхтаваліся на бітву каля брамы гораду, а валадары, якія
прыйшлі, [стаялі] асобна ў полі.
10 І ўбачыў Ёаў, што будзе ў яго бітва сьпераду і ззаду, і выбраў усіх выбранцоў Ізраіля, і
выставіў іх у шыхт супраць Араму.
11 А рэшту народу даў пад руку Абішая, брата свайго, і яны сталі ў шыхце супраць сыноў Амона.
12 І сказаў ён: «Калі Арам будзе мацнейшы за мяне, ты прыйдзеш на дапамогу мне; а калі сыны
Амона будуць мацнейшыя за цябе, я дапамагу табе.
13 Будзь моцны, і будзем цьвёрда стаяць за народ наш і за гарады Бога нашага. А ГОСПАД няхай
зробіць, што добра ў вачах Ягоных».
14 І вырушыў Ёаў і народ, які з ім, на бітву з Арамам; і тыя ўцяклі перад абліччам ягоным.
15 А сыны Амона ўбачылі, што ўцёк Арам, і самі ўцяклі ад Абішая, брата ягонага, і ўвайшлі ў
горад, а Ёаў пайшоў у Ерусалім.
16 І ўбачыў Арам, што яны пабітыя перад абліччам Ізраіля, і паслаў пасланцоў, і прывялі
Арамлянаў, якія былі з таго боку ракі, і Шафах, князь войска Гададэзэра, [быў] на чале іх.
17 І паведамілі Давіду, і ён сабраў усяго Ізраіля, і перайшоў Ярдан, і прыйшоў да іх, і паставіў
шыхт супраць іх, і паставіў шыхт Давід для бітвы супраць Арама, і біліся з ім.
18 І ўцёк Арам перад абліччам Ізраіля, і забіў Давід у Арама сем тысячаў калясьнічнікаў, і сорак
тысячаў пяхотнікаў, і Шафаха, князя войска, усьмерціў.
19 І ўбачылі слугі Гададэзэра, што яны пабітыя перад абліччам Ізраіля, і замірыліся з Давідам,
і служылі яму. І не хацеў Арам больш ратаваць сыноў Амона.

1 Лет 20

1 І сталася праз год, у часе выхаду валадароў [на вайну], вывеў Ёаў войска вялікае, і спустошыў
зямлю сыноў Амона, і прыйшоў, і аблёг Раббу. А Давід застаўся ў Ерусаліме. І здабыў Ёаў Раббу,
і зруйнаваў яе.
2 І ўзяў Давід карону валадара іхняга з галавы ягонай; і знайшоў, што яна важыла талент
золата, і быў на ёй камень каштоўны; і была яна на галаве ў Давіда. І здабычы вельмі шмат ён
вынес з гораду.
3 А народ, які быў у ім, вывеў і палажыў іх пад пілы, і цапы жалезныя, і сякеры. Гэтак зрабіў
Давід з усімі гарадамі сыноў Амона. І вярнуўся Давід і ўвесь народ у Ерусалім.
4 І сталася пасьля гэтага, пачалася вайна з Філістынцамі ў Гэзэры. Тады Сібэхай Хушанін забіў
Сіпая, аднаго з нашчадкаў Рэфаімаў, і яны былі пабітыя.
5 І яшчэ была вайна з Філістынцамі. І Эльханан, сын Яіра, забіў Ляхмі, брата Галіята, Хітыта, у
якога тронак дзіды быў як навой ткацкі.
6 І была яшчэ вайна ў Гаце, і быў адзін чалавек высокага росту, у якога было па шэсьць пальцаў,
усяго дваццаць чатыры, і ён таксама паходзіў з Рэфаімаў.
7 І ён блюзьніў на Ізраіля; і забіў яго Ёнатан, сын Шымы, брата Давіда.
8 Гэта былі народжаныя з Рэфаімаў у Гаце, і яны загінулі ад рукі Давіда і ад рукі слугаў ягоных.

1 Лет 21

1 І паўстаў шатан на Ізраіля, і зьвёў Давіда, каб ён палічыў Ізраіля.
2 І сказаў Давід Ёаву і князям народу: «Ідзіце, палічыце Ізраіль ад Бээр-Шэвы аж да Дана, і
прынясіце мне, каб я ведаў лік іхні».

3 І сказаў Ёаў: «Няхай памножыць ГОСПАД стакроць народ Свой больш таго, колькі яго ёсьць.
Ці ня ўсе яны, гаспадару мой, валадару, слугі гаспадара майго? Навошта шукае гэтага гаспадар
мой? Навошта гэта мае быць віною Ізраілю?»
4 Але слова валадара перамагло Ёава; і выйшаў Ёаў, і хадзіў па ўсім Ізраілі, і прыйшоў у
Ерусалім.
5 І даў Ёаў лічбу палічанага народу Давіду; і было ўсіх Ізраільцян тысяча тысячаў і сто тысячаў
мужоў, якія выцягваюць меч, а ў Юды — чатырыста семдзясят тысячаў, якія выцягваюць меч.
6 А Левія і Бэн'яміна ён не палічыў між імі, бо слова валадара было агідным для Ёава.
7 І кепскай была ў вачах Божых справа гэтая, і Ён ударыў Ізраіля.
8 І сказаў Давід Богу: «Моцна саграшыў я, што зрабіў рэч гэтую. І цяпер даруй беззаконьне
слузе Твайму, бо я зрабіў вельмі неразумна».
9 І прамовіў ГОСПАД да Гада, відушчага Давіда, кажучы:
10 «Ідзі і прамоў да Давіда, кажучы: "Гэта кажа ГОСПАД. Тры [кары] Я кладу перад табою.
Выбяры сабе адну з іх, і Я зраблю табе"».
11 І прыйшоў Гад да Давіда, і сказаў яму: «Гэта кажа ГОСПАД: "Вазьмі сабе
12 або тры гады голаду, або тры месяцы будзеш уцякаць перад ворагамі тваімі, і меч ворагаў
тваіх будзе даганяць цябе; або тры дні — меч ГОСПАДА і пошасьць на зямлі, і анёл ГОСПАДА
будзе нішчыць у-ва ўсіх межах Ізраіля". І цяпер разваж, якое слова прынесьці мне Таму, Хто
паслаў мяне».
13 І сказаў Давід Гаду: «Цяжка мне вельмі! Лепш патраплю ў рукі ГОСПАДА, бо вельмі вялікая
міласьць Ягоная, але я ня траплю ў рукі чалавека».
14 І спаслаў ГОСПАД заразу на Ізраіля, і памерла ў Ізраілі семдзясят тысячаў мужоў.
15 І паслаў Бог анёла ў Ерусалім, каб нішчыць яго. І, калі ён нішчыў, глянуў ГОСПАД, і
пашкадаваў, што [адбываецца] ліха, і сказаў анёлу нішчыцелю: «Досыць ужо! Стрымай руку
тваю». А анёл ГОСПАДА стаяў каля току Арнана Евусэя.
16 І ўзьняў Давід вочы свае, і ўбачыў анёла ГОСПАДА, які стаяў паміж зямлёй і небам, і меч
ягоны аголены ў руцэ ягонай, скіраваны на Ерусалім. І ўпаў Давід і старшыні, якія былі
апранутыя ў зрэбніцы, на абліччы свае.
17 І сказаў Давід Богу: «Ці ж ня я сказаў, каб палічыць народ? І я — той, хто саграшыў і ўчыніў
злачынства. А гэтыя авечкі, што яны зрабілі? ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Няхай будзе рука Твая на
мне і на доме бацькі майго, а ў народзе Тваім няхай ня будзе загубы».
18 І анёл ГОСПАДА сказаў Гаду, і ён сказаў Давіду, каб Давід пайшоў і паставіў ахвярнік
ГОСПАДУ на таку Арнана Евусэя.
19 І пайшоў Давід, паводле слова Гада, якое ён прамовіў у імя ГОСПАДА.
20 І павярнуў Арнан, і ўбачыў анёла, і чатыры сыны ягоныя, [што былі] з ім, і схаваліся. А
Арнан малаціў пшаніцу.
21 І прыйшоў Давід да Арнана. І глянуў Арнан, і ўбачыў Давіда, і выйшаў з току, і пакланіўся
Давіду абліччам да зямлі.
22 І сказаў Давід Арнану: «Дай мне месца току, і я пабудую на ім ахвярнік ГОСПАДУ. За срэбра
поўнай [вагі] дай мне яго, і будзе забраная пляга ад народу».
23 І сказаў Арнан Давіду: «Вазьмі сабе [яго], і няхай гаспадар мой, валадар, робіць тое, што
добрае ў вачах ягоных. Глядзі, я даю валоў на цэласпаленьне, і малатарню на дровы, і пшаніцу
— на ахвяру хлебную, усё гэта я даю».
24 І сказаў валадар Давід Арнану: «Не, бо, купляючы, куплю за срэбра поўнай [вагі], бо не
вазьму таго, што тваё, каб скласьці ГОСПАДУ ахвяру цэласпаленьня дармовага».
25 І даў Давід Арнану за месца гэтае золата вагою шэсьцьсот сыкляў.
26 І пабудаваў там Давід ахвярнік ГОСПАДУ, і склаў ахвяры цэласпаленьня, і ахвяры мірныя, і
клікаў ГОСПАДА, і Ён адказаў яму агнём з неба на ахвярнік цэласпаленьня.
27 І сказаў ГОСПАД анёлу, і ён вярнуў меч свой у похвы свае.
28 У той час, калі ўбачыў Давід, што адказаў яму ГОСПАД на таку Арнана Евусэя, ён склаў там
ахвяру.

29 А Сяліба ГОСПАДА, якую зрабіў Майсей у пустыні, і ахвярнік цэласпаленьня былі ў той час
на ўзгорку ў Гібэоне.
30 І ня мог Давід пайсьці да яго, каб спытацца ў Бога, бо быў напалоханы мячом анёла ГОСПАДА.

1 Лет 22

1 І сказаў Давід: «Тут [будзе] Дом ГОСПАДА Бога, і тут [будзе] ахвярнік цэласпаленьня для
Ізраіля».
2 І сказаў Давід, каб сабралі прыхадняў, якія былі ў зямлі Ізраіля, і паставіў каменяроў рабіць
чэсаныя камяні на будоўлю Дому Божага.
3 І мноства жалеза на цьвікі для брамных варотаў і на клямкі падрыхтаваў Давід, і мноства
медзі, [што] не было вагі,
4 і дрэва кедровага бяз ліку, бо Сідонцы і Тырыяне прывезьлі для Давіда шмат дрэва кедровага.
5 І сказаў Давід: «Салямон, сын мой, — малады і кволы, а Дом, які будзе пабудаваны для
ГОСПАДА, мае быць вялікі і ўзьнесены, для славы і велічы на ўсёй зямлі. Я падрыхтую гэта
для яго». І падрыхтаваў Давід мноства [ўсяго] перад сьмерцю сваёй.
6 І паклікаў Салямона, сына свайго, і загадаў яму пабудаваць Дом ГОСПАДУ, Богу Ізраіля.
7 І сказаў Давід Салямону: «Сыне мой, я меў у сэрцы маім пабудаваць Дом для імя ГОСПАДА,
Бога майго.
8 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы: “Ты разьліў шмат крыві і вёў войны вялікія. Ты не
пабудуеш Дом для імя Майго, бо ты разьліў шмат крыві на зямлі перада абліччам Маім.
9 Вось, сын народзіцца ў цябе, ён будзе чалавек супакою, і Я дам яму супакой ад усіх ворагаў
ягоных навокал, бо імя ягонае будзе Салямон. Мір і цішыню Я дам Ізраілю ў дні ягоныя.
10 Ён пабудуе Дом для імя Майго, і ён будзе Мне сынам, а Я яму — Бацькам, і Я ўмацую пасад
валадарства ягонага над Ізраілем на вякі”.
11 Цяпер, сыне мой, няхай будзе ГОСПАД з табою, і будзеш мець посьпех, і пабудуеш Дом
ГОСПАДУ, Богу твайму, як Ён прамовіў пра цябе.
12 Толькі няхай дасьць табе ГОСПАД розум і разуменьне, і няхай паставіць цябе над Ізраілем,
а ты захоўвай Закон ГОСПАДА, Бога твайго.
13 Тады ты будзеш мець посьпех, калі будзеш захоўваць і выконваць пастановы і прысуды, якія
загадаў ГОСПАД праз Майсея для Ізраіля. Будзь цьвёрды і мужны, ня бойся і не палохайся.
14 І вось, я ў нястачы сваёй падрыхтаваў для Дому ГОСПАДА золата сто тысячаў талентаў і
срэбра тысяча тысячаў талентаў, а медзі і жалезу няма вагі, бо іх мноства. І дрэва, і камяні я
падрыхтаваў, а ты яшчэ дадай да гэтага.
15 У цябе мноства работнікаў для працы; каменяроў і разьбяроў, і цесьляроў, і ўсіх, здольных
да ўсякай работы.
16 Золата, срэбра, медзі і жалезу няма лічбы. Устань і рабі; і ГОСПАД будзе з табою».
17 І загадаў Давід усім князям Ізраіля, каб дапамагалі Салямону, сыну ягонаму:
18 «Ці ГОСПАД, Бог ваш, ня з вамі? І Ён даў супакой навокал, бо Ён аддаў у рукі мае жыхароў
зямлі гэтай, і здабытая зямля гэтая перад абліччам ГОСПАДА і перад абліччам народу Ягонага.
19 Цяпер скіруйце сэрцы вашыя і душы вашыя, каб шукаць ГОСПАДА, Бога вашага. Устаньце
і пабудуйце сьвятыню ГОСПАДУ Богу, каб прынесьці Каўчэг Запавету ГОСПАДА і сьвятое
начыньне Божае ў Дом, які пабудаваны для імя ГОСПАДА».

1 Лет 23

1 І Давід стаў стары і насычаны днямі, і ён паставіў Салямона, сына свайго, за валадара над
Ізраілем.
2 І сабраў ён усіх князёў, і сьвятароў, і лявітаў.
3 І былі палічаны лявіты ад трыццаці гадоў і вышэй; і быў лік іхні, паводле галоваў мужчынаў,
— трыццаць восем тысячаў.
4 З іх для кіраваньня працаю ў Доме ГОСПАДА — дваццаць чатыры тысячы, а наглядчыкаў і
судзьдзяў — шэсьць тысячаў.

5 І чатыры тысячы прыдзьвернікаў, і чатыры тысячы тых, якія хваляць ГОСПАДА на
[музычных] інструмэнтах, якія зробленыя для хвалы.
6 І падзяліў іх Давід на чэргі паводле сыноў Левія — Гершома, Кегата і Мэрары.
7 З [сыноў] Гершома — Лаэдан і Шымэй.
8 Сыны Лаэдана: галоўны — Ехіэль, Зэтам і Ёэль, тры.
9 Сыны Шымэя: Шэляміт, Хазіэль і Харан, тры. Гэта галовы [дамоў] бацькоў Лаэдана.
10 Сыны Шымэя: Яхат, Зіна, Еуш і Бэрыя. Гэта сыны Шымэя, чатыры.
11 Яхат быў галоўны, а Зіна — другі; але Еуш і Бэрыя ня мелі шмат сыноў, і яны былі ў адной
чарзе дому бацькі [свайго].
12 Сыны Кегата: Амрам, Іцгар, Хеўрон і Узіэль, чатыры.
13 Сыны Амрама: Аарон і Майсей. Аарон быў аддзелены, каб пасьвяціць яго для Сьвятога
Сьвятых, яго і сыноў ягоных, на вякі, каб яны кадзілі перад абліччам ГОСПАДА, каб служылі
Яму і дабраслаўлялі ў імя Ягонае на вякі.
14 А Майсей [быў] чалавек Божы, сыны ягоныя залічаныя да калена Левія.
15 Сын Майсея: Гершом і Эліэзэр.
16 Сыны Гершома: Шэвуэль галоўны.
17 І былі сыны Эліэзэра: Рэхавія галоўны. І не было ў Эліэзэра іншых сыноў, а сыноў Рэхавіі
было вельмі шмат.
18 Сыны Іцгара: Шэляміт галоўны.
19 Сыны Хеўрона: Ерыя галоўны, Амарыя другі, Ехазіэль трэці, Екамэам чацьвёрты.
20 Сыны Узіэля: Міха галоўны, Ішшыя другі.
21 Сыны Мэрары: Махлі і Мушы. Сыны Махлі: Элеазар і Кіш.
22 І памёр Элеазар, і не было ў яго сыноў, але толькі дочкі; і ўзялі іх сыны Кіша, браты іхнія.
23 Сыны Мушы: Махлі, Эдэр, Ірэмот, тры.
24 Гэта сыны Левія, паводле дамоў бацькоў сваіх, галовы [дамоў] бацькоў, паводле сьпісаў
сваіх, паводле ліку імёнаў, паводле галоваў іхніх, якія рабілі працу служэньня ў Доме
ГОСПАДА, ад дваццаці гадоў і вышэй.
25 Бо Давід сказаў: «ГОСПАД, Бог Ізраіля, даў супакой народу Свайму, і Ён будзе жыць у
Ерусаліме на вякі.
26 І таксама лявітам ня трэба насіць Сялібу і ўсялякія прылады ейныя для служэньня ў ёй».
27 Таму, паводле апошніх словаў Давіда, палічаны сыны Левія ад дваццаці гадоў і вышэй,
28 бо занятак іхні — быць пры сынах Аарона для служэньня ў Доме ГОСПАДА, на панадворках
і ў пакоях, і дзеля ачышчэньня ўсяго сьвятога, і для выкананьня служэньня ў Доме Божым,
29 і пры хлябах пакладных, і пры муцэ для ахвяры хлебнай, пры печыве прэсным, пры тым,
што печанае і што смажанае, і пры ўсім, што ўзважваюць і мераюць,
30 і каб яны станавіліся кожную раніцу славіць і хваліць ГОСПАДА, а таксама ўвечары,
31 і пры ахвярах цэласпаленьня для ГОСПАДА ў суботы, у маладзік і ў сьвяты, у ліку, паводле
парадку, вызначанага ім, назаўсёды перад абліччам ГОСПАДА,
32 і каб яны стаялі на варце пры Намёце Спатканьня, на варце сьвятыні, і на варце пры сынах
Аарона, братах сваіх, на служэньні ў Доме ГОСПАДА.

1 Лет 24

1 І вось чэргі сыноў Аарона. Сыны Аарона: Надаў, Абігу, Элеазар і Ітамар.
2 І памерлі Надаў і Абігу перад абліччам бацькі свайго, а сыноў не было ў іх; і былі сьвятарамі
Элеазар і Ітамар.
3 І падзяліў іх Давід і Цадок з сыноў Элеазара, і Ахімэлех з сыноў Ітамара, на чэргі іхнія паводле
служэньня іхняга.
4 І больш знайшлося галоўных мужоў з сыноў Элеазара, чым з сыноў Ітамара. І былі яны
падзелены: з сыноў Элеазара — шаснаццаць галоваў дамоў бацькоў іхніх, з сыноў Ітамара —
восем, паводле дамоў бацькоў іхніх.

5 І падзялілі іх жэрабем, адных і другіх, каб былі князі сьвятыні і князі Божыя з сыноў Элеазара
і з сыноў Ітамара.
6 І запісаў іх Шэмая, сын Нэтаніэля, пісар з лявітаў, перад абліччам валадара і князёў, і перад
Цадокам сьвятаром і Ахімэлехам, сынам Абіятара, і перад галовамі [дамоў] бацькоў сьвятароў
і лявітаў. Адзін дом бацькоў узяты ад Элеазара, і адзін — ад Ітамара.
7 І выпала першае жэрабя на Егаярыва, другое — на Едаю.
8 на Харыма трэцяе, на Сэарыма чацьвёртае,
9 на Малхію пятае, на Міяміна шостае,
10 на Гаккоца сёмае, на Абію восьмае,
11 на Ешуа дзявятае, на Шэханію дзясятае,
12 на Эляшыва адзінаццатае, на Якіма дванаццатае,
13 на Хуппу трынаццатае, на Ешэвава чатырнаццатае,
14 на Більгу пятнаццатае, на Імэра шаснаццатае,
15 на Хэзіра сямнаццатае, на Гапіцэца васямнаццатае,
16 на Пэтахію дзевятнаццатае, на Ехэзкэля дваццатае,
17 на Яхіна дваццаць першае, на Гамуля дваццаць другое,
18 на Дэлаю дваццаць трэцяе, на Маазію дваццаць чацьвёртае.
19 Гэта чэргі іхнія для служэньня іхняга, каб яны прыходзілі ў Дом ГОСПАДА паводле
пастановы сваёй, [дадзенай] праз Аарона, бацьку іхняга, як загадаў яму ГОСПАД, Бог Ізраіля.
20 А пазасталыя з сыноў Левія: з сыноў Амрама — Шуваэль; з сыноў Шуваэля — Ехдэя;
21 Ад Рэхаўі з сыноў Рэхаўі галоўны Ішыя.
22 Ад Іцгара — Шэлямот; з сыноў Шэлямота — Яхат.
23 Сыны [Хеўрона]: Ерыя, Амарыя другі, Яхазіэль трэці, Екамэам чацьвёрты.
24 Сыны Узіэля: Міха; з сыноў Міхі — Шамір.
25 Брат Міхі — Ішыя; з сыноў Ішыі — Захарыя.
26 Сыны Мэрары: Махлі і Мушы. Сыны Яазіі: Бэно.
27 Сыны Мэрары з Яазіі: Бэно, Шагам, Заккур і Іўры.
28 Ад Махлі — Элеазар; і не было ў яго сыноў.
29 Ад Кіша сыны Кіша: Ерахмээль.
30 Сыны Мушы: Махлі, Эдэр і Ерымот. Гэта сыны лявітаў паводле дамоў бацькоў іхніх.
31 І кідалі яны таксама жэрабя, як і браты іхнія, сыны Аарона, перад абліччам валадара Давіда,
і Цадока, і Ахімэлеха, і перад галовамі [дамоў] бацькоў сьвятарскіх і лявіцкіх, галовы [дамоў]
бацькоў аднолькава з меншым братам сваім.

1 Лет 25

1 І аддзяліў Давід і князі войска на служэньне сыноў Асафа і Гэмана, і Едутуна, каб яны гралі
на гусьлях, псалтырах і цымбалах. І быў лік мужоў пры працы гэтай у служэньні іхнім:
2 з сыноў Асафа: Заккур, Язэп, Нэтанія, Асарэла, сыны Асафа, пад рукою Асафа, які граў пад
рукою валадара.
3 Ад Едутуна сыны Едутуна: Гэдалія, Цэры, Ешая, Хашавія і Матытыя, шасьцёра пад рукою
Едутуна, бацькі іхняга, які граў на гусьлях на славу і хвалу для ГОСПАДА.
4 Ад Гэмана сыны Гэмана: Буккія, Маттанія, Узіэль, Шэвуэль, Ерымот, Хананія, Ханані, Эліята,
Гідалты, Ромамты-Эзэр, Ёшбэкаша, Маллоты, Махазіёт.
5 Усе гэтыя — сыны Гэмана, відушчага валадара ў словах Божых, каб узвышаўся рог [ягоны]. І
даў Бог Гэману чатырнаццаць сыноў і тры дачкі.
6 Усе яны пад рукою бацькі свайго сьпявалі ў Доме ГОСПАДА з цымбаламі, псалтырамі і
гусьлямі на служэньні ў Доме Божым, пад рукою валадара: Асаф, Едутун і Гэман.
7 І быў лік іх з братамі іхнімі, навучанымі сьпяваць для ГОСПАДА, усіх настаўнікаў — дзьвесьце
восемдзясят восем.
8 І кінулі яны жэрабя пра чаргу служэньня, як малы, так і вялікі, настаўнік і вучань.

9 І выпала першае жэрабя ад Асафа на Язэпа; другім [стаў] Гэдалія, ён і браты ягоныя, і сыны
ягоныя — дванаццаць;
10 трэці — Заккур; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
11 чацьвёрты — Іцры; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
12 пяты — Нэтанія; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
13 шосты — Буккія; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
14 сёмы — Есарыэла; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
15 восьмы — Ешая; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
16 дзявяты — Маттанія; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
17 дзясяты — Шымэй; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
18 адзінаццаты — Азарэль; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
19 дванаццаты — Хашавія; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
20 трынаццаты — Шуваэль; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
21 чатырнаццаты — Матытыя; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
22 пятнаццаты — Ерымот; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
23 шаснаццаты — Хананія; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
24 сямнаццаты — Ёшбэкаша; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
25 васямнаццаты — Ханані; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
26 дзевятнаццаты — Маллоты; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
27 дваццаты — Эліята; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
28 дваццаць першы — Гатыра; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
29 дваццаць другі — Гідалты; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
30 дваццаць трэці — Махазіёт; сыноў ягоных і братоў ягоных дванаццаць;
31 дваццаць чацьвёрты — Ромамты-Эзэр; сыноў ягоных і ратоў ягоных дванаццаць.

1 Лет 26

1 Чэргі прыдзьвернікаў, з [сыноў] Караха: Мэшэлемія, сын Карэ, з сыноў Асафа.
2 І ў Мэшэлеміі сыны: Захарыя першародны, Эдыяэль другі, Зэвадыя трэці, Ятніэль чацьвёрты,
3 Элям пяты, Егаханан шосты, Эліэгаэнай сёмы.
4 Сыны Абэд-Эдома: Шэмая першародны, Егазавад другі, Ёах трэці, Сахар чацьвёрты, Натанаэль пяты,
5 Аміэль шосты, Ісахар сёмы, Пэўлетай восьмы, бо Бог дабраславіў яго.
6 І ў Шэмаі, сына ягонага, нарадзіліся сыны, якія кіравалі ў доме бацькі свайго, бо яны магутныя і мужныя.
7 Сыны Шэмаі: Атні і Рафаэль, Абэд, Элізавад, браты ягоныя, сыны магутныя, Элігу і Самахія.
8 Усе яны — з сыноў Абэд-Эдома; яны, і сыны іхнія, і браты іхнія, мужы магутныя, здатныя да служэньня: шэсьдзясят два з Абэд-Эдома.
9 І ў Мэшэлеміі сыноў і братоў, сыноў магутных — васямнаццаць.
10 І ў Хосы, з сыноў Мэрары, [былі] сыны: Шымры галоўны, хоць ён ня быў першародны, але бацька ягоны паставіў яго за галоўнага,
11 Хілкія другі, Тэвалія трэці, Захарыя чацьвёрты; усіх сыноў і братоў у Хосы [было] трынаццаць.
12 З іх былі чэргі прыдзьвернікаў, з галоўных мужоў, якія трымалі варту з братамі сваімі на служэньні ў Доме ГОСПАДА.
13 І кідалі яны жэрабя, як малы, так і вялікі, паводле дамоў бацькоў сваіх, пра кожную браму.
14 І выпала жэрабя на ўсход для Шэлеміі. Для Захарыі, сына ягонага, разумнага дарадцы, кідалі жэрабя, і выпала яму жэрабя на поўнач;
15 для Абэд-Эдома — на поўдзень, а сынам ягоным — каморы;
16 для Шуппіма і Хосы — на захад, каля брамы Шалехет, пры шырокай дарозе, якая ўзыходзіць, варта насупраць варты.

17 На ўсход — шэсьць лявітаў, на поўнач — на дзень чатыры, на поўдзень — на дзень чатыры, і
пры каморах — два;
18 на панадворку на захад — чатыры пры шырокай дарозе і два на самім панадворку.
19 Гэта чэргі прыдзьвернікаў, сыноў Караха і сыноў Мэрары.
20 І лявіты: Ахія — над скарбніцамі Дому Божага і над скарбніцамі рэчаў пасьвячоных.
21 Сыны Лаэдана, сына Гершона, ад Лаэдана, галовы [дому] бацькоў Лаэдана, сына Гершона:
Ехіэль.
22 Сыны Ехіэля: Зэтам і Ёэль, брат ягоны, — над скарбніцамі Дому ГОСПАДА.
23 Для [сыноў] Амрама, Іцгара, Хеўрона і Узіэля:
24 Шэвуэль, сын Гершома, сына Майсея, быў уладаром над скарбніцамі.
25 І браты ягоныя ад Элезэра: Рэхавія, сын ягоны, і Ішая, сын ягоны, і Ёрам, сын ягоны, і Зіхры,
сын ягоны, і Шэляміт, сын ягоны.
26 Шэляміт і браты ягоныя [былі] над усімі скарбніцамі рэчаў пасьвячоных, якія пасьвяцілі
валадар Давід і галовы [дамоў] бацькоў, тысячнікі, сотнікі і князі войска.
27 З заваяваньняў і са здабычы яны пасьвячалі на падтрыманьне Дому ГОСПАДА.
28 І ўсё, што пасьвяціў Самуэль відушчы, і Саўл, сын Кіша, і Абнэр, сын Нэра, і Ёаў, сын Цэруі
— усё пасьвечана [было] ў рукі Шэляміта і братоў ягоных.
29 З [сыноў] Іцгара: Кенанія і сыны ягоныя — на служэньне вонкавае ў Ізраілі, наглядчыкамі і
судзьдзямі.
30 З [сыноў] Хеўрона: Хашавія і браты ягоныя, сыны мужныя, тысяча семсот, мелі нагляд над
Ізраілем на гэтым баку Ярдану, на захад, у-ва ўсёй працы для ГОСПАДА і службе валадарскай.
31 У [сыноў] Хеўрона Ерыя — галава [сыноў] Хеўрона, паводле радаводаў бацькоў сваіх. У
саракавы год валадараньня Давіда шукалі і знайшлі сярод іх [людзей] магутных і мужных у
Язэры Гілеадзкім.
32 І браты ягоныя, сыны мужныя, дзьве тысячы семсот, галовы [дамоў] бацькоў. І паставіў
іх валадар Давід над [сынамі] Рубэна, Гада і над паловай Манасы ў-ва ўсіх справах Божых і
справах валадара.

1 Лет 27

1 Сыны Ізраіля паводле ліку іхняга, галовы [дамоў] бацькоў, і начальнікі тысячаў і сотняў,
і наглядчыкі іхнія, што паслугавалі валадару ў-ва ўсіх справах харугваў, якія прыходзілі і
выходзілі месяц у месяц, усе месяцы году. Кожная харугва — дваццаць чатыры тысячы.
2 Над харугвай першай, на месяц першы — Яшобаам, сын Забдыэля; у харугве ягонай —
дваццаць чатыры тысячы;
3 Ён быў з сыноў Пэрэса, галоўны над усімі начальнікамі войска першага месяца.
4 І над харугвай другога месяца — Дадай Ахахіянін, і ў харугве ягонай Міклот, начальнік; у
харугве ягонай — дваццаць чатыры тысячы.
5 Князь трэцяй харугвы на трэці месяц — Бэная, сын Егаяды, галоўнага сьвятара; і ў харугве
ягонай — дваццаць чатыры тысячы.
6 Гэты Бэная [быў] магутны сярод трыццаці і [быў] над трыццацьцю; і ў харугве ягонай [быў]
Амізавад, сын ягоны.
7 Чацьвёрты на чацьвёрты месяц — Асаэль, брат Ёава, і пасьля яго Зэвадыя, сын ягоны; і ў
харугве ягонай — дваццаць чатыры тысячы.
8 Пяты на пяты месяц — князь Шамгут Ізрахянін; і ў харугве ягонай — дваццаць чатыры
тысячы.
9 Шосты на шосты месяц — Іра, сын Ікеша, з Тэкоа; і ў харугве ягонай — дваццаць чатыры
тысячы.
10 Сёмы на сёмы месяц — Хэлец, Пэланянін, з сыноў Эфраіма; і ў харугве ягонай — дваццаць
чатыры тысячы.
11 Восьмы на восьмы месяц — Сібэхай Хушанін, з Зархітаў; і ў харугве ягонай — дваццаць
чатыры тысячы.
12 Дзявяты на дзявяты месяц — Абіэзэр з Анатоту, з [сыноў] Бэн’яміна; і ў харугве ягонай —
дваццаць чатыры тысячы.

13 Дзясяты на дзясяты месяц — Маграй з Нэтофы, з Зархітаў; і ў харугве ягонай — дваццаць
чатыры тысячы.
14 Адзінаццаты на адзінаццаты месяц — Бэная з Піратону, з сыноў Эфраіма; і ў харугве ягонай
— дваццаць чатыры тысячы.
15 Дванаццаты на дванаццаты месяц — Хэлдай з Нэтофы, з Атніэля; і ў харугве ягонай —
дваццаць чатыры тысячы.
16 А над каленамі Ізраіля [былі]: у Рубэна — начальнік Эліэзэр, сын Зіхры, у Сымона —
Шэфатыя, сын Маахі;
17 у Левія — Хашавія, сын Кемуэля; у Аарона — Цадок;
18 у Юды — Элігу, з братоў Давіда; у Ісахара — Амры, сын Міхаэля;
19 у Завулёна — Ішмая, сын Абадыі; у Нэфталі — Ерымот, сын Азрыэля.
20 у сыноў Эфраіма — Осія, сын Азазіі; у паловы калена Манасы — Ёэль, сын Пэдаі;
21 у паловы Манасы ў Гілеадзе — Іддо, сын Захарыі; у Бэн'яміна — Яасіэль, сын Абнэра;
22 у Дана — Азарэль, сын Ерахама. Гэта князі каленаў Ізраіля.
23 Давід не лічыў тых, што былі ад дваццаці гадоў і ніжэй, бо ГОСПАД сказаў, што Ён памножыць
Ізраіля, як зоркі ў небе.
24 Ёаў, сын Цэруі, пачаў рабіць перапіс і ня скончыў. І быў за гэта гнеў [Божы] на Ізраіля, і не
ўвайшоў той лік у лікі летапісу валадара Давіда.
25 Над скарбніцамі валадара быў Азмавэт, сын Адыэля, а над гумнамі ў полі, у гарадах, у вёсках
і ў вежах — Ёнатан, сын Узіі.
26 Над тымі, што рабілі працу ў полі, абраблялі грунты [быў] Эзры, сын Келува,
27 над вінаграднікамі — Шымэй з Рамы; а над запасамі віна ў вінных скарбніцах — Заўдыя з
Шыфмы;
28 над дрэвамі аліўнымі і над дрэвамі фігавымі, якія ў Шэфэлі — Баал-Ханан з Гедэру; а над
скарбніцамі аліўнымі — Ёаш;
29 над валамі, якія пасьвяцца ў Шароне — Шытрай з Шарону; а над валамі ў далінах — Шафат,
сын Адлая;
30 над вярблюдамі — Авіл Ізмаэлец; над асьліцамі — Ехдэя з Мэраноту;
31 над авечкамі — Языз Гагранін. Усе яны — князі над маёмасьцю, якая ў валадара Давіда.
32 Ёнатан, дзядзька Давіда, быў дарадцам, ён — чалавек разумны і пісьменны; Ехіэль, сын
Хахмоні, [быў] з сынамі валадара;
33 Ахітафэль — дарадца валадара; Хушай Аркеец — сябра валадара.
34 Пасьля Ахітафэля [быў] Егаяда, сын Бэнаі, і Эбіятар; а начальнікам войска валадара [быў]
Ёаў.

1 Лет 28

1 І сабраў Давід у Ерусалім усіх князёў Ізраіля, князёў каленаў і начальнікаў харугваў, якія
служылі валадару, і начальнікаў над тысячамі, і начальнікаў над сотнямі, і князёў над усёй
маёмасьцю, і над статкамі валадара, і над сынамі ягонымі разам з урадоўцамі і мужнымі
[ваярамі], і ўсімі ваярамі магутнымі.
2 І стаў валадар Давід на ногі свае, і сказаў: «Паслухайце мяне, браты мае і народ мой! Было
ў мяне ў сэрцы пабудаваць Дом супачынку для Каўчэгу Запавету ГОСПАДА і падножжа пад
стопы Бога нашага, і я падрыхтаваўся да будоўлі.
3 Але Бог сказаў мне: "Ня ты пабудуеш Дом для імя Майго, бо ты — чалавек вайны і ты разьліваў
кроў".
4 І выбраў ГОСПАД, Бог Ізраіля, мяне з усяго дому бацькі майго, каб я быў валадаром над
Ізраілем на вякі, бо Ён выбраў Юду за правадыра, і з дому Юды — дом бацькі майго, і з сыноў
бацькі майго ўпадабаў мяне, каб паставіць валадаром над усім Ізраілем.
5 І з усіх сыноў маіх, бо шмат сыноў даў мне ГОСПАД, Ён выбраў Салямона, сына майго, каб ён
сеў на пасадзе валадарства ГОСПАДА над Ізраілем.

6 І Ён сказаў мне: “Салямон, сын твой, ён пабудуе Дом Мой і панадворкі Мае, бо Я выбраў яго
Сабе за сына, і Я буду яму Бацькам;
7 І Я ўмацую валадарства ягонае на вякі, калі ён будзе цьвёрды ў выкананьні прыказаньняў
Маіх і прысудаў Маіх, як гэта ёсьць сёньня”.
8 І цяпер перад вачыма ўсяго Ізраіля, царквы ГОСПАДА, і ў вушы Бога нашага [я кажу]:
“Пільнуйце і выконвайце ўсе прыказаньні ГОСПАДА, Бога вашага, каб вы валодалі гэтай
зямлёй добрай і пакінулі яе ў спадчыну для сыноў вашых пасьля вас на вякі.
9 І ты, Салямоне, сыне мой, ведай Бога, Айца твайго, і служы Яму з сэрцам шчырым і душою
ахвотнаю, бо ГОСПАД дасьледуе ўсе сэрцы і разумее ўсе намеры думак. Калі будзеш шукаць
Яго, ты знойдзеш Яго; а калі пакінеш Яго, Ён пакіне цябе назаўжды.
10 Глядзі цяпер, бо ГОСПАД выбраў цябе, каб ты пабудаваў Дом як сьвятыню. Будзь цьвёрды і
рабі”».
11 І даў Давід Салямону, сыну свайму, узор прысенку і будынкаў [сьвятыні] і скарбніцаў ейных,
і верхніх пакояў ейных, і ўнутраных пакояў ейных, і дому перамольваньня,
12 і ўзор усяго, што было ў духу ягоным для панадворку Дому ГОСПАДА і для ўсіх пакояў
навокал, для скарбніцаў Дому Божага і скарбніцаў рэчаў пасьвячоных,
13 і для чэргаў сьвятароў і лявітаў, і для ўсёй працы пры служэньні ў Доме ГОСПАДА, і для ўсіх
начыньняў для служэньня ў Доме ГОСПАДА.
14 [І даў ён] золата вагою на залатыя [рэчы], на ўсе начыньні для ўсялякага служэньня; [і
срэбра] на ўсе начыньні срэбныя, на ўсе начыньні для ўсялякага служэньня;
15 [золата] для сьвечнікаў залатых і для лямпаў іхніх залатых, вагою кожнага сьвечніка і
лямпаў ягоных, і [срэбра] для сьвечнікаў срэбных, вагою кожнага сьвечніка і лямпаў ягоных,
паводле прызначэньня кожнага сьвечніка,
16 і золата вагою на сталы хлябоў пакладных на кожны стол, і срэбра на сталы срэбныя,
17 і на відэльцы, і на крапільніцы, і на місы з золата шчырага, і на келіхі залатыя вагою на
кожны келіх, і на келіхі срэбныя вагою на кожны келіх,
18 і на ахвярнік каджэньня золата шчырага вагою, і на вобраз калясьніцы херувімаў, якія
разгортваюць крылы свае і закрываюць Каўчэг Запавету ГОСПАДА.
19 [І сказаў:] «Усё гэта запісанае з рукі ГОСПАДА. Ён даў мне зразумець усю працу паводле
ўзору гэтага».
20 І сказаў Давід Салямону, сыну свайму: «Будзь цьвёрды і мужны, і рабі. Ня бойся і не
палохайся, бо ГОСПАД Бог, Бог мой, з табою. Ён не адыйдзе ад цябе і не пакіне цябе, пакуль ня
скончыцца ўся праца для служэньня ў Доме ГОСПАДА.
21 І, вось чэргі сьвятароў і лявітаў для ўсялякага служэньня ў Доме Божым. З табою ў-ва ўсёй
працы ўсе [людзі] шляхетныя, мудрыя на ўсялякае служэньне. І князі, і ўвесь народ [гатовыя
выканаць] усе словы твае».

1 Лет 29

1 І сказаў валадар Давід усёй царкве: «Салямон, сын мой, якога аднаго выбраў Бог, малады і
кволы, а праца гэта вялікая, бо не для чалавека будыніна гэтая, але для ГОСПАДА Бога.
2 З усёй сілай маёй я падрыхтаваў для Дому Бога майго золата на [рэчы] залатыя, і срэбра —
на срэбныя, і медзь — на мядзяныя, жалеза — на жалезныя, і дрэва — на драўляныя, камяні
оніксу і для аправаў камяні аздобныя і каляровыя, і ўсялякія камяні каштоўныя, і мноства
мармуровых камянёў.
3 І яшчэ, з зычлівасьці маёй для Дому Бога майго, я маю ўласнае золата і срэбра; і я аддаў на
Дом Бога майго, звыш усяго, што я падрыхтаваў на Дом Сьвяты:
4 тры тысячы талентаў золата, золата Афірскага, і сем тысячаў талентаў срэбра чыстага на
ашаляваньне сьценаў пабудоваў.
5 Золата — на [рэчы залатыя], срэбра — на срэбныя і на ўсю працу рук разьбяроў. І хто [яшчэ]
ахвяруецца, каб сёньня напоўніць руку сваю для ГОСПАДА?»

6 І склалі дары князі [дамоў] бацькоў, князі каленаў Ізраіля, і начальнікі тысячаў і сотняў, і
начальнікі працаў валадара.
7 І далі на служэньне Дому Божага золата пяць тысячаў талентаў і дзесяць тысячаў дукатаў, і
срэбра дзесяць тысячаў талентаў, і медзі васямнаццаць тысячаў талентаў, і жалеза сто тысячаў
талентаў.
8 Тыя, у каго знайшліся камяні [каштоўныя], давалі ў скарбніцу Дому ГОСПАДА на рукі Ехіэля,
сына Гершона.
9 І радаваўся народ з дабраахвотных дароў, бо са шчырым сэрцам яны давалі дары ГОСПАДУ;
і таксама валадар радаваўся радасьцю вялікай.
10 І дабраславіў Давід ГОСПАДА перад вачыма ўсёй царквы, і сказаў Давід: «Дабраслаўлёны
Ты, ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, бацькі нашага, ад веку і на вякі!
11 Твае, ГОСПАДЗЕ, веліч і магутнасьць, і праслаўленьне, хвала і годнасьць, бо ўсё ў небе і на
зямлі Тваё; Тваё, ГОСПАДЗЕ, валадарства, і Ты ўзьнесены па-над усім як галава.
12 І багацьце, і слава — ад Цябе, і Ты пануеш над усім; і ў руцэ Тваёй сіла і моц; і ў руцэ Тваёй
узьвялічыць і ўмацаваць усё.
13 І цяпер, Божа наш, мы выслаўляем Цябе і хвалім імя велічнасьці Тваёй.
14 Бо хто я і хто народ мой, што мы маем сілу так ахвотна прыносіць дары? Бо ўсё гэта — ад
Цябе, і з рукі Тваёй мы [атрымалі і] аддалі Табе.
15 Бо мы — прыхадні перад абліччам Тваім, як усе бацькі нашыя. Дні нашыя на зямлі, як цень,
і няма трываласьці.
16 ГОСПАДЗЕ, Божа наш! Усё гэтае мноства, якое мы падрыхтавалі, каб пабудаваць Табе Дом
для імя сьвятога Твайго — з рукі Тваёй, і ўсё гэта — Тваё.
17 І я ведаю, Божа мой, што Ты выспрабоўваеш сэрца, і шчырасьць даспадобы Табе. І я ў
шчырасьці сэрца майго ахвотна прынёс у дар усё гэта. І цяпер я бачу з радасьцю народ Твой,
які знаходзіцца тут і дабраахвотна прыносіць дары Табе.
18 ГОСПАДЗЕ, Божа Абрагама, Ісаака і Ізраіля, бацькоў нашых, захавай на вякі намер думак
сэрца народу Твайго і ўмацуй сэрца іхняе пры Сабе!
19 І дай Салямону, сыну майму, сэрца шчырае, каб захоўваў прыказаньні Твае, сьведчаньні
Твае і пастановы Твае, і выканаў усё, і пабудаваў будыніну, якую я падрыхтаваў».
20 І сказаў Давід усёй царкве: «Дабраславіце ГОСПАДА, Бога вашага!» І дабраславіла ўся царква
ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, і схіліліся, і пакланіліся ГОСПАДУ і валадару.
21 І яны ахвяравалі ахвяры для ГОСПАДА, і ўзносілі цэласпаленьні ГОСПАДУ назаўтра пасьля
гэтага дня: тысячу бычкоў, тысячу бараноў, тысячу ягнят і ахвяры вадкія, і мноства ахвяраў
за ўвесь Ізраіль.
22 І елі, і пілі перад абліччам ГОСПАДА ў гэты дзень з вялікай радасьцю, і другім разам паставілі
як валадара Салямона, сына Давіда, і памазалі яго перад ГОСПАДАМ як начальніка, а Цадока —
як сьвятара.
23 І сеў Салямон на пасад ГОСПАДА як валадар замест Давіда, бацькі свайго, і меў посьпех, і
слухаў яго ўвесь Ізраіль.
24 І ўсе князі і волаты, а таксама ўсе сыны валадара Давіда далі руку Салямону валадару.
25 І надзвычай узьвялічыў ГОСПАД Салямона перад вачыма ўсяго Ізраіля, і даў яму велічнасьць
валадарскую, якой ня было ў аніводнага валадара перад абліччам Ягоным у Ізраілі.
26 І Давід, сын Есэя, валадарыў над усім Ізраілем.
27 І дзён, у якія ён валадарыў над Ізраілем, было сорак гадоў: у Хеўроне ён валадарыў сем
гадоў, а ў Ерусаліме валадарыў трыццаць тры гады.
28 І ён памёр у добрай старасьці, насычаны днямі, багацьцем і славаю; і Салямон, сын ягоны,
заваладарыў замест яго.
29 І справы Давіда валадара, першыя і апошнія, вось, яны запісаныя ў летапісах Самуэля,
відушчага, і ў летапісах Натана, прарока, і ў летапісах Гада, відушчага,
30 разам з усім валадараньнем ягоным, і з магутнасьцю ягонаю, і з часамі, што мінулі над ім,
і над Ізраілем, і над усімі валадарствамі зямлі гэтай.

ДРУГАЯ КНІГА ЛЕТАПІСАЎ

1 І ўмацаваўся Салямон, сын Давіда, на валадарстве сваім; і ГОСПАД, Бог ягоны [быў] з ім, і
ўзьвялічыў яго высока.
2 І сказаў Салямон усяму Ізраілю, начальнікам тысячаў і сотняў, і судзьдзям, і ўсім
начальнікам у-ва ўсім Ізраілі, галовам [дамоў] бацькоў.
3 І пайшлі Салямон і ўся царква з ім на ўзвышша, якое ў Гібэоне, бо там быў Божы Намёт
Спатканьня, які паставіў Майсей, слуга ГОСПАДА, у пустыні.
4 Каўчэг Божы перанёс Давід з Кірыят-Ярыму на [месца], якое Давід падрыхтаваў для яго, бо
ён паставіў для яго намёт у Ерусаліме.
5 А ахвярнік, які зрабіў Бэцалеэль, сын Урыі, сына Хура, застаўся там перад Сялібай ГОСПАДА;
і шукалі яго Салямон і царква.
6 І ўзыйшоў Салямон перад аблічча ГОСПАДА туды да ахвярніка мядзянага, які ў Намёце
Спатканьня, і ахвяраваў на ім тысячу цэласпаленьняў.
7 У тую ноч зьявіўся Бог Салямону і сказаў яму: «Прасі, што Мне даць табе».
8 І сказаў Салямон Богу: «Ты зрабіў Давіду, бацьку майму, вялікую ласку і паставіў мяне
валадарыць замест яго.
9 Цяпер, ГОСПАДЗЕ Божа, няхай зьдзейсьніцца слова Тваё Давіду, бацьку майму, бо Ты паставіў
мяне валадарыць над народам вялікім, як пыл зямлі.
10 Дай мне цяпер мудрасьць і веданьне, каб я мог выходзіць і ўваходзіць перад народам гэтым,
бо хто можа судзіць гэты народ Твой такі вялікі?»
11 І сказаў Бог Салямону: «За тое, што было гэта ў сэрцы тваім, і ты не прасіў багацьця,
маёмасьці, славы ці душы ворагаў тваіх, таксама не прасіў доўгіх дзён, але прасіў для сябе
мудрасьці і веданьня, каб ты мог судзіць народ Мой, над якім Я паставіў цябе валадарыць,
12 мудрасьць і веданьне дадзены табе, а багацьці, маёмасьць і славу Я дам табе, якіх ніводзін з
валадароў ня меў перад табою і ня будзе мець ніякі пасьля цябе».
13 І вярнуўся Салямон з узвышша, якое ў Гібэоне, у Ерусалім ад аблічча Намёту Спатканьня, і
валадарыў у Ізраілі.
14 І сабраў Салямон калясьніцы і вершнікаў, і было ў яго тысяча чатырыста калясьніцаў і
дваццаць тысячаў вершнікаў, якіх ён разьмясьціў у гарадах калясьнічных і пры валадары ў
Ерусаліме.
15 І сабраў валадар срэбра і золата ў Ерусаліме, як камянёў, а кедраў так шмат, як сікамораў,
якія ў Шэфэлі.
16 І прыводзілі для Салямона коней з Эгіпту і з Куэ, бо купцы валадарскія куплялі паводле цаны
[іхняй] у Куэ.
17 І яны зыходзілі і прывозілі з Эгіпту калясьніцы за шэсьцьсот сыкляў срэбра і каня за сто
пяцьдзясят [сыкляў]. І гэтак праз рукі іхнія прывозілі іх для ўсіх валадароў Хетаў і валадароў
Араму.

2 Лет 2

1 І сказаў Салямон пабудаваць Дом для імя ГОСПАДА і дом для валадарства свайго.
2 І прызначыў Салямон семдзясят тысячаў чалавек насіць цяжары, і восемдзясят тысячаў
каменяроў у гарах, і тры тысячы шэсьцьсот наглядчыкаў над імі.
3 І паслаў Салямон да Хурама, валадара Тыру, кажучы: «Як ты дапамагаў Давіду, бацьку
майму, і пасылаў яму кедры, каб ён пабудаваў дом, каб жыць у ім, так зрабі і мне.
4 Вось, я будую Дом для імя ГОСПАДА, Бога майго, каб сьвяціць Яго і кадзіць перад абліччам
Ягоным пахкае кадзіла, і каб заўсёды [былі там] хлябы пакладныя і цэласпаленьні раніцаю і
ўвечары, у суботы і ў маладзік, і ва ўрачыстасьці ГОСПАДА, Бога нашага. Гэта на вякі ў Ізраілі.
5 І Дом гэты, які я будую, вялікі, бо вялікі Бог наш, [большы] за ўсіх багоў.

6 І ці стане ў каго сілы пабудаваць Дом для Яго, бо неба і нябёсы нябёсаў не зьмяшчаюць Яго?
І хто я, каб мог пабудаваць Дом для Яго? Хіба толькі [магу] кадзіць перад абліччам Ягоным.
7 І цяпер прышлі мне чалавека мудрага, каб працаваць з золатам і срэбрам, з медзьдзю,
жалезам, пурпурам, кармазынам і блакітам, які ўмее выразаць рэзьбы, [каб працаваць] з
мудрымі людзьмі, якія ў мяне ў Юдзе і ў Ерусаліме, якіх падрыхтаваў Давід, бацька мой.
8 І пашлі мне дрэва кедровае, кіпарысавае і сандалавае з Лібану, бо я ведаю, што слугі твае
ўмеюць сячы дрэвы ў Лібане. І вось, слугі мае [будуць] са слугамі тваімі,
9 каб падрыхтаваць мне шмат дрэва, бо Дом, які я будую, [будзе] вялікі і цудоўны.
10 І вось, для дрывасекаў, якія сякуць дрэвы, слугаў тваіх, я даў на ежу дваццаць тысячаў кораў
пшаніцы, і дваццаць тысячаў кораў ячменю, і дваццаць тысячаў батаў віна, і дваццаць тысячаў
батаў алею».
11 І сказаў Хурам, валадар Тыру, у лісьце, і паслаў Салямону: «Палюбіў ГОСПАД народ Свой, і
паставіў цябе за валадара над ім».
12 І сказаў Хурам: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які ўчыніў неба і зямлю, Які даў
Давіду валадару сына мудрага, які мае розум і веданьне, які пабудуе Дом ГОСПАДУ і дом для
валадарства свайго.
13 І цяпер я паслаў чалавека мудрага, які мае веданьне і ўменьні, Хурам-Абію,
14 сына жанчыны з дачок Дана, і бацькі ягонага, чалавека з Тыру. Ён умее рабіць з золата,
срэбра, медзі, жалеза, камяня, дрэва, пурпуру, блакіту, вісону і кармазыну; і выразаць
усялякую разьбу, і майстраваць усялякае мастацтва, якое будзе дадзена яму [рабіць] з
майстрамі тваімі і майстрамі пана майго Давіда, бацькі твайго.
15 І цяпер пшаніцу, ячмень, алей і віно, пра якія гаварыў гаспадар мой, пашлі для слугаў тваіх.
16 І мы будзем сячы дрэвы з Лібану, паводле ўсіх патрэбаў тваіх, і прыгонім іх табе плытамі па
моры ў Яфу, і ты завязеш іх у Ерусалім».
17 І палічыў Салямон усіх прыхадняў, якія ў зямлі Ізраіля, пасьля сьпісу, якім палічыў іх Давід,
бацька ягоны, і знайшлося іх сто пяцьдзясят тры тысячы шэсьцьсот.
18 І прызначыў ён з іх семдзясят тысячаў для нашэньня цяжараў, і восемдзясят тысячаў
каменяроў у гарах, і тры тысячы шэсьцьсот наглядчыкаў над працамі народу гэтага.

2 Лет 3

1 І пачаў Салямон будаваць Дом ГОСПАДА ў Ерусаліме, на гары Морыя, дзе ГОСПАД зьявіўся
Давіду, бацьку ягонаму, на месцы, якое падрыхтаваў Давід, на таку Арнана Евусэя.
2 І пачаў ён будаваць у другі [дзень] другога месяца, у чацьвёртым годзе валадараньня свайго.
3 І гэта падмурак, які заклаў Салямон для будаўніцтва Дому Божага: даўжыня — шэсьцьдзясят
локцяў, і шырыня паводле меры старадаўняй дваццаць локцяў;
4 і прысенак, які сьпераду, у даўжыню паводле шырыні Дому — дваццаць локцяў, а ў вышыню
— сто дваццаць. І ашаляваў яго ўнутры чыстым золатам.
5 І Дом вялікі накрыў дрэвам кіпарысавым, і ашаляваў шчырым золатам, і парабіў на ім
пальмы і ланцужкі.
6 І пакрыў Дом камянямі каштоўнымі дзеля аздабленьня; а золата — золата Парваімскае.
7 І ашаляваў ён Дом, бэлькі, парогі, сьцены ягоныя і дзьверы ягоныя золатам; і выразаў
херувімаў на сьценах.
8 І пабудаваў дом для Сьвятога Сьвятых; даўжыня ягоная, паводле шырыні Дому — дваццаць
локцяў, і шырыня ягоная — дваццаць локцяў; і ашаляваў яго шчырым золатам, на шэсьцьсот
талентаў.
9 А вага цьвікоў — пяцьдзясят сыкляў золата. І верхнія пакоі ашаляваў золатам.
10 І зрабіў у доме Сьвятога Сьвятых двух херувімаў разьбярскай работы, і пакрыў іх золатам.
11 Крылы херувімаў у даўжыню — дваццаць локцяў. Адно крыло ў пяць локцяў дакраналася
сьцяны дому, а другое крыло ў пяць локцяў дакраналася да крыла другога херувіма;
12 І крыло другога херувіма ў пяць локцяў дакраналася сьцяны дому, а другое крыло ў пяць
локцяў дакраналася да крыла іншага херувіма.

13 Крылы гэтых херувімаў былі расхінутыя на дваццаць локцяў; і яны стаялі на нагах сваіх, і абліччы іхнія — у бок Дому.
14 І зрабіў завесу з блакіту, пурпуру, кармазыну і вісону, і выгафтаваў на ёй херувімаў.
15 І зрабіў перад Домам два слупы, трыццаць пяць локцяў у вышыню, і галавіцу, якая на версе іх, — у пяць локцяў.
16 І зрабіў ланцужкі, як у Давіры, і зьмясьціў на версе слупоў, і зрабіў сто яблыкаў гранатовых, і зьмясьціў на ланцужках.
17 І паставіў слупы перад сьвятыняй, адзін з правага боку, другі — з левага, і назваў імя правага Яхін, а імя левага — Боаз.

2 Лет 4

1 І зрабіў ахвярнік мядзяны: дваццаць локцяў даўжыня ягоная, і дваццаць локцяў шырыня ягоная, і дзесяць локцяў вышыня ягоная.
2 І зрабіў мора адліванае, дзесяць локцяў ад берагу яго да берагу яго, усё круглае, у вышыню пяць локцяў; і шнур у трыццаць локцяў атачаў яго наўкола.
3 І пад ім падабенствы валоў стаялі наўкола з усіх бакоў; на дзесяць локцяў атачалі мора навокал два шэрагі валоў, адлітых пры адліваньні яго.
4 Стаяла яно на дваццаці валах: тры зьвернутыя на поўнач, тры зьвернутыя на захад, тры зьвернутыя на поўдзень, тры зьвернутыя на ўсход, і мора на іх зьверху; а азадкі іхнія [зьвернуты] ў сярэдзіну.
5 І таўшчыня ягоная — у далонь, і берагі ягоныя — як берагі келіха, як кветкі лілеі. Яно зьмяшчала і ўтрымлівала тры тысячы батаў.
6 І зрабіў дзесяць мыцельнікаў, і паставіў пяць з правага боку і пяць — з левага, для абмываньня ў іх, бо падрыхтаванае на цэласпаленьне паласкалі ў іх; а мора — для сьвятароў, каб яны абмываліся ў ім.
7 І зрабіў дзесяць залатых сьвечнікаў, паводле пастановы, і паставіў у сьвятыні, пяць — з правага боку і пяць — з левага.
8 І зрабіў дзесяць сталоў, і паставіў у сьвятыні, пяць — з правага боку і пяць — з левага, і зрабіў сто місаў залатых.
9 І зрабіў панадворак сьвятарскі, і вялікі панадворак, і дзьверы ў панадворак, і ашаляваў дзьверы медзьдзю.
10 І паставіў мора з правага боку на ўсходзе, насупраць паўднёвага боку.
11 І зрабіў Хурам гаршчкі, лапаткі і місы. І скончыў Хурам рабіць працу, якую ён рабіў для валадара Салямона ў Доме Божым:
12 два слупы і кулі, і галавіцы на версе двух слупоў, і два сплеціва, каб накрыць дзьве круглыя галавіцы, якія на версе слупоў,
13 і чатырыста яблыкаў гранатовых на двух сплецівах, два шэрагі яблыкаў гранатовых на кожным сплеціве, каб пакрыць дзьве круглыя галавіцы, якія на слупах.
14 І падставы зрабіў, і мыцельнікі зрабіў на падставах,
15 адно мора, і дванаццаць валоў пад ім.
16 І гаршчкі, і лапаткі, і відэльцы, і ўсе начыньні зрабіў Хурам-Абія для валадара Салямона ў Доме ГОСПАДА, з зыркай медзі.
17 У ваколіцах Ярдану адліваў іх валадар, у густой зямлі, паміж Сукотам і Цэрэдаю.
18 І зрабіў Салямон усе начыньні гэтыя ў вялікім мностве, што не даведваліся вагі медзі.
19 І зрабіў Салямон усе рэчы Дому Божага: і ахвярнік залаты, і сталы, і на іх хлябы пакладныя,
20 і сьвечнікі, і лямпы для запальваньня іх паводле пастановы перад Давірам — са шчырага золата;
21 і кветкі, і лямпы, і абцужкі залатыя, з найчысьцейшага золата,
22 і нажніцы, і місы, і крапільніцы, і кадзільніцы са шчырага золата; і ўваход у Дом, унутраныя дзьверы ягоныя ў Сьвятое Сьвятых, і дзьверы Дому сьвятыні — з золата.

2 Лет 5

1 І скончана была ўся праца, якую рабіў Салямон для Дому Божага. І прынёс Салямон сьвятыя
[рэчы] Давіда, бацькі свайго, і срэбра, і золата, і ўсе начыньні палажыў у скарбніцу Дому
Божага.
2 Тады паклікаў Салямон старшыняў Ізраіля і ўсіх галоваў плямёнаў, князёў [дамоў] бацькоў
сыноў Ізраіля, у Ерусалім, каб перанесьці Каўчэг Запавету ГОСПАДА з гораду Давіда, значыць
з Сыёну.
3 І сабраліся да валадара ўсе людзі Ізраіля на сьвята, якое ў сёмы месяц.
4 І прыйшлі ўсе старшыні Ізраіля; і ўзялі лявіты Каўчэг,
5 і перанесьлі Каўчэг, і Намёт Спатканьня, і ўсе рэчы сьвятыя, якія ў Намёце, і панесьлі іх
сьвятары і лявіты.
6 І валадар Салямон і ўся грамада Ізраіля, якая сабралася пры ім перад Каўчэгам, ахвяроўвалі
авечак і валоў, якіх нельга было палічыць і запісаць з прычыны мноства.
7 І прынесьлі сьвятары Каўчэг Запавету ГОСПАДА на месца ягонае, у Давір Дому, у Сьвятое
Сьвятых, пад крылы херувімаў.
8 І былі херувімы з раскінутымі крыламі над месцам Каўчэгу, і херувімы ахіналі Каўчэг і
насілы ягоныя.
9 І тыя насілы былі доўгія, і канцы насілаў Каўчэгу былі відаць перад Давірам, але не было іх
відаць звонку; і яны там да сёньняшняга дня.
10 Нічога не было ў Каўчэгу, толькі дзьве табліцы, якія Майсей палажыў на Харэве, калі ГОСПАД
заключыў запавет з сынамі Ізраіля, калі яны выйшлі з Эгіпту.
11 І сталася, калі сьвятары выйшлі са сьвятыні, бо ўсе сьвятары, якія былі там, асьвяціліся, і не
было патрэбы захоўваць чэргі.
12 А лявіты сьпевакі, усе яны, Асаф, Гэман, Едутун, і сыны іхнія, і браты іхнія, апранутыя ў
вісон, з цымбаламі, псалтырамі і гусьлямі стаялі на ўсход ад ахвярніка, і з імі сто дваццаць
сьвятароў, якія трубілі ў трубы.
13 І былі як адзін тыя, што трубілі, і тыя, што сьпявалі, даючы адзін голас на хвалу і
праслаўленьне ГОСПАДА; і калі ўзьнёсься гук трубаў і цымбалаў, і музычных інструмэнтаў,
і хвалілі ГОСПАДА, бо добры Ён, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная, тады Дом, Дом ГОСПАДА
напоўніўся хмараю,
14 і не маглі сьвятары стаяць і служыць перада хмараю, бо слава ГОСПАДА напоўніла Дом
Божы.

2 Лет 6

1 Тады сказаў Салямон: «ГОСПАД сказаў, што Ён жыве ў імгле.
2 А я пабудаваў Дом на пражываньне Табе і месца знаходжаньня Твайго на вякі».
3 І павярнуў валадар аблічча сваё, і дабраславіў усю царкву Ізраіля, а ўся царква стаяла.
4 І ён сказаў: «Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, Які гаварыў вуснамі Сваімі Давіду, бацьку
майму, і выканаў [гэта] рукамі Сваімі, кажучы:
5 “Ад дня, у які Я вывеў народ Мой з зямлі Эгіпецкай, Я ня выбраў гораду з усіх каленаў Ізраіля,
каб пабудаваць дом, у якім было б імя Маё, і ня выбраў чалавека, які быў бы начальнікам
народу Майго, Ізраіля,
6 але Я выбраў Ерусалім, каб там было імя Маё, і выбраў Давіда, каб ён быў над народам Маім,
Ізраілем”.
7 І было на сэрцы ў Давіда, бацькі майго, пабудаваць Дом для ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
8 І ГОСПАД сказаў Давіду, бацьку майму: “Тое, што было на сэрцы тваім, каб пабудаваць Дом
для імя Майго, добра ты зрабіў, што гэта ў сэрцы тваім.
9 Толькі ты не пабудуеш Дом, але сын твой, які выйдзе са сьцёгнаў тваіх, ён пабудуе Дом для
імя Майго”.
10 І споўніў ГОСПАД слова Сваё, якое прамовіў, і я стаў на месца Давіда, бацькі майго, і сеў на
пасадзе Ізраіля, як сказаў ГОСПАД, і пабудаваў Дом для імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
11 І я паставіў там Каўчэг, у якім запавет ГОСПАДА, які заключыў Ён з сынамі Ізраіля».

12 І стаў ён перад ахвярнікам ГОСПАДА насупраць усёй царквы Ізраіля, і выцягнуў рукі свае,
13 бо Салямон зрабіў амбону мядзяную і паставіў яе сярод панадворку; даўжыня ейная пяць
локцяў, і шырыня ейная пяць локцяў, і вышыня ейная тры локці. І ён стаў на ёй, і ўпаў на
калені свае насупраць усёй царквы, і выцягнуў рукі свае да неба,
14 і сказаў: «ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля! Няма Бога, падобнага да Цябе, ані ў небе, ані на зямлі.
Ты захоўваеш запавет і міласэрнасьць да слугаў Тваіх, якія ходзяць перад абліччам Тваім усім
сэрцам сваім.
15 Ты споўніў слузе Твайму Давіду, бацьку майму, тое, што Ты сказаў яму; што сказаў Ты
вуснамі Тваімі, тое ў дзень гэты споўніў рукою Тваёй.
16 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, споўні слузе Твайму Давіду, бацьку майму, тое, што Ты
сказаў яму, кажучы: “Ня будзе забраны ў цябе муж перад абліччам Маім, які сядзіць на пасадзе
Ізраіля, калі толькі сыны твае будуць захоўваць шляхі свае, каб хадзіць паводле закону Майго
так, як ты хадзіў перад абліччам Маім”.
17 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля, няхай будзе зьдзейсьнена слова Тваё, якое Ты сказаў слузе
Твайму Давіду.
18 Бо, сапраўды, ці Бог будзе жыць з чалавекам на зямлі? Калі неба і нябёсы нябёсаў ня могуць
агарнуць Цябе, тым менш [можа] Дом гэты, які я пабудаваў.
19 Але ўзглянь на малітву слугі Твайго і на маленьне ягонае, ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Пачуй
кліканьне і малітву, якімі слуга Твой моліцца перад абліччам Тваім.
20 Няхай будуць вочы Твае адчыненыя на Дом гэты ўдзень і ўначы, на месца, пра якое Ты
сказаў, што імя Тваё пакладзеш там, каб чуць малітву, якою слуга Твой будзе маліцца на месцы
гэтым.
21 І Ты пачуй маленьні слугі Твайго і народу Твайго Ізраіля, якімі яны будуць маліцца на месцы
гэтым, пачуй з месца знаходжаньня Твайго, з нябёсаў, пачуй і прабач!
22 Калі саграшыць чалавек супраць бліжняга свайго, і будуць вымагаць ад яго прысягі, каб ён
прысягнуў, і будзе адбывацца прысяга перад ахвярнікам Тваім у Доме гэтым,
23 Ты пачуй з неба, і зрабі, і судзі слугаў Тваіх, зьвяртаючы бязбожнаму, каб прыйшоў шлях
ягоны на галаву ягоную, і апраўдваючы праведнага, даючы яму паводле праведнасьці ягонай.
24 Калі народ Твой Ізраіль будзе пабіты перад абліччам ворага, бо ён саграшыў перад Табою, і
яны навернуцца, і будуць славіць імя Тваё, і будуць маліцца, і будуць прасіць перад абліччам
Тваім у Доме гэтым,
25 Ты пачуй з неба, і прабач грэх народу Твайго Ізраіля, і вярні іх у зямлю, якую Ты даў ім і
бацькам іхнім.
26 Калі будзе замкнутае неба і ня будзе дажджу за тое, што яны саграшылі перад Табою, і
будуць яны маліцца на месцы гэтым, і будуць славіць імя Тваё, і адвернуцца ад грахоў сваіх,
бо Ты пакараў іх,
27 Ты пачуй з неба і прабач грэх слугаў тваіх і народу Твайго Ізраіля, навучыўшы іх шляху
добраму, па якім яны будуць ісьці, і пашлі дождж на зямлю Тваю, якую Ты даў народу Твайму
ў спадчыну.
28 Калі будзе голад на зямлі, або будзе пошасьць, або будзе суша, або іржа, саранча або чэрві,
або будуць прыгнятаць яго ворагі ягоныя ў зямлі, дзе брамы ягоныя, [або будзе] якая бяда ці
якая хвароба,
29 кожную малітву, кожнае маленьне, якое будзе ад нейкага чалавека альбо ад усяго народу
Твайго Ізраіля, калі кожны з іх адчуе бяду сваю і гора сваё, і яны выцягнуць далоні свае да
Дому гэтага,
30 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго, і прабач, і дай кожнаму паводле ўсіх шляхоў
ягоных, бо Ты ведаеш сэрца ягонае, бо толькі Ты ў сэрцы Тваім ведаеш сэрцы сыноў чалавечых,
31 каб яны баяліся Цябе і хадзілі шляхамі Тваімі ўсе дні, у якія жывуць яны на абліччы зямлі,
якую Ты даў бацькам нашым.
32 І таксама чужынец, які не з народу Твайго Ізраіля, калі ён прыйдзе з зямлі далёкай дзеля імя
Твайго вялікага, і рукі Тваёй магутнай, і рамяна Твайго ўзьнятага, і прыйдзе, і будзе маліцца
ў Доме гэтым,

33 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго, і зрабі ўсё, пра што будзе клікаць да Цябе
чужынец, каб пазналі ўсе народы зямлі імя Тваё і каб баяліся Цябе, як народ Твой, Ізраіль, каб
ведалі, што імя Тваё заклікаецца над Домам гэтым, які я пабудаваў.
34 Калі выйдзе народ Твой на вайну супраць ворагаў сваіх шляхам, якім Ты пашлеш яго, і будзе
маліцца Табе ў накірунку гораду гэтага, які Ты абраў, і Дому, які я пабудаваў для імя Твайго,
35 Ты пачуй з неба малітву іхнюю і маленьне іхняе, і ўчыні суд для іх.
36 Калі яны саграшаць перад Табою, бо няма чалавека, які не саграшыў бы, і Ты загневаешся
на іх, і аддасі іх ворагам, і яны возьмуць іх у няволю ў зямлю далёкую або блізкую,
37 і калі яны схамянуцца ў сэрцы сваім у зямлі, у якую будуць палонены, і навернуцца, і будуць
прасіць Цябе ў зямлі няволі сваёй, кажучы: “Мы саграшылі, правініліся і былі бязбожнікамі”,
38 і навернуцца да Цябе ўсім сэрцам сваім і ўсёй душою сваёй у зямлі няволі сваёй, у якой
яны палонены, і будуць маліцца ў накірунку зямлі сваёй, якую Ты даў бацькам іхнім, і гораду
гэтага, які Ты абраў, і Дому, які я пабудаваў для імя Твайго,
39 Ты пачуй з неба, з месца знаходжаньня Твайго, малітву іхнюю і маленьне іхняе, і ўчыні суд
для іх, і прабач народу Твайму, які саграшыў перад Табою.
40 Цяпер, Божа мой, няхай будуць вочы Твае адчыненыя і вушы Твае ўважлівыя да малітвы на
месцы гэтым.
41 І цяпер, ГОСПАДЗЕ Божа, стань на [месца] супачынку Твайго, Ты і Каўчэг моцы Тваёй.
Сьвятары Твае, ГОСПАДЗЕ Божа, няхай апрануцца ў збаўленьне, і сьвятыя Твае няхай радуюцца
добраму.
42 ГОСПАДЗЕ Божа! Не адвярні аблічча ад памазанца Твайго, узгадай пра міласэрнасьць для
Давіда, слугі Твайго».

2 Лет 7

1 Калі скончыў Салямон малітву, зыйшоў агонь з неба, і праглынуў цэласпаленьні і ахвяры, і
слава ГОСПАДА напоўніла Дом.
2 І не маглі сьвятары ўвайсьці ў Дом ГОСПАДА, бо слава ГОСПАДА напоўніла Дом ГОСПАДА.
3 І ўсе сыны Ізраіля, бачачы, як зыйшоў агонь і слава ГОСПАДА на Дом, упалі абліччам на
зямлю, на падлогу, і пакланіліся, і выслаўлялі ГОСПАДА, бо Ён добры, бо на вякі міласэрнасьць
Ягоная.
4 І валадар і ўвесь народ ахвяравалі ахвяры перад абліччам ГОСПАДА.
5 І ахвяраваў валадар Салямон як ахвяру дваццаць дзьве тысячы валоў і сто дваццаць тысячаў
авечак, і асьвяцілі Дом Божы валадар і ўвесь народ.
6 А сьвятары стаялі на варце сваёй, і лявіты з музычнымі інструмэнтамі ГОСПАДАВЫМІ, якія
зрабіў валадар Давід для праслаўленьня ГОСПАДА, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная, бо Давід
выхваляў [Бога] імі. І сьвятары трубілі перад імі, і ўвесь Ізраіль стаяў.
7 І асьвяціў Салямон сярэдзіну панадворку, які перад Домам ГОСПАДА, бо там прынёс
цэласпаленьні і тлушч ахвяраў мірных, бо ахвярнік мядзяны, які зрабіў Салямон, ня мог
зьмясьціць цэласпаленьняў, і ахвяраў хлебных, і тлушчу.
8 І зрабіў Салямон у той час сьвята на сем дзён, і ўвесь Ізраіль з ім, царква вельмі вялікая, [якая
сабралася] ад уваходу ў Хамат аж да ракі Эгіпецкай.
9 І зрабілі ў восьмы дзень урачысты сход, бо асьвячэньне ахвярніка рабілі сем дзён, і
сьвяткавалі сем дзён.
10 І ў дваццаць трэці дзень сёмага месяца адпусьціў [Салямон] народ у намёты іхнія, радасных
і з добрым сэрцам дзеля дабра, якое зрабіў ГОСПАД Давіду, і Салямону, і Ізраілю, народу
Свайму.
11 І скончыў Салямон Дом ГОСПАДА і дом валадара; і ў-ва ўсім, што прыйшло ў сэрца Салямону
зрабіць у Доме ГОСПАДА і ў доме сваім, ён меў посьпех.
12 І зьявіўся ГОСПАД Салямону ўначы, і сказаў яму: «Я пачуў малітву тваю і выбраў Сабе месца
гэтае на Дом для ахвяраваньня.
13 Калі Я замкну неба і ня будзе дажджу, і калі загадаю саранчы жэрці зямлю, альбо спашлю
пошасьць на народ Мой,

14 і калі ўпакорыцца народ Мой, які завецца імем Маім, і будзе маліцца і шукаць аблічча Маё,
і адвернуцца ад шляхоў сваіх ліхіх, Я пачую з неба і прабачу грахі іхнія, і аздараўлю зямлю
іхнюю.
15 Цяпер вочы Мае будуць адчыненыя і вушы Мае ўважлівыя да малітвы на месцы гэтым.
16 І цяпер Я выбраў і асьвяціў Дом гэты, каб імя Маё было там на вякі; і вочы Мае і сэрца Маё
будуць там усе дні.
17 І цяпер, калі ты будзеш хадзіць перад абліччам Маім, як хадзіў Давід, бацька твой, і рабіць
паводле ўсяго, што Я загадаў табе, і захоўваць пастановы Мае і суды Мае,
18 Я ўмацую пасад валадарства твайго, як Я заключыў [запавет] з Давідам, бацькам тваім,
кажучы: “Ня будзе забраны ў цябе муж, які пануе ў Ізраілі”.
19 А калі вы адвернецеся і пакінеце пастановы Мае і прыказаньні Мае, якія Я даў вам, і
пойдзеце, і будзеце служыць іншым багам, і будзеце пакланяцца ім,
20 Я выкараню вас з зямлі Маёй, якую Я даў вам, і гэты Дом, які Я асьвяціў для імя Майго, Я
адкіну ад аблічча Майго і аддам яго на прыказку і насьмешку для ўсіх народаў.
21 І Дом гэты, які быў найвышэйшы, [будзе такі, што] ўсе, якія будуць праходзіць каля яго,
аслупянеюць і скажуць: “За што зрабіў так ГОСПАД зямлі гэтай і Дому гэтаму?”
22 І скажуць: “За тое, што яны пакінулі ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, Які вывеў іх з зямлі
Эгіпецкай, і ўхапіліся за багоў іншых, і пакланяліся ім, і служылі ім, за тое Ён навёў на іх усё
гэтае ліха”».

2 Лет 8

1 І сталася па заканчэньні дваццатага году, калі Салямон пабудаваў Дом ГОСПАДА і дом свой,
2 што тыя гарады, якія даў Салямону Хурам, забудаваў Салямон і пасяліў там сыноў Ізраіля.
3 І пайшоў Салямон у Хамат-Цову, і перамог яе.
4 І забудаваў ён Тадмор у пустыні, і ўсе гарады сьвірнаў, якія пабудаваў у Хамаце.
5 І ён забудаваў Бэт-Харон верхні і Бэт-Харон ніжні, гарады ўмацаваныя, з мурамі, брамамі і
заваламі,
6 і Баалат, і ўсе гарады сьвірнаў, якія былі ў Салямона, і ўсе гарады калясьніцаў, і гарады
вершнікаў, і ўсё, што надумаў Салямон пабудаваць у Ерусаліме, і на Лібане, і ў-ва ўсёй зямлі
панаваньня свайго.
7 Увесь народ, які застаўся з Хетаў, Амарэйцаў, Пэрэзэяў, Гівеяў, якія не з Ізраіля,
8 з сыноў іхніх, якія засталіся пасьля іх у зямлі, якіх ня зьнішчылі сыны Ізраіля, зрабіў Салямон
даньнікамі аж да сёньняшняга дня.
9 А сыноў Ізраіля не зрабіў Салямон слугамі пры працы сваёй, бо яны [былі] людзьмі
вайсковымі і начальнікамі выбранцоў, і начальнікамі над калясьніцамі ягонымі і вершнікамі
ягонымі.
10 І яны былі князямі-намесьнікамі, якія ў валадара Салямона, — дзьвесьце пяцьдзясят, якія
мелі ўладу над народам.
11 І перавёў Салямон дачку фараона з гораду Давіда ў дом, які пабудаваў для яе; бо ён казаў:
«Ня будзе жыць жонка мая ў доме Давіда, валадара Ізраіля, бо ён сьвяты, бо ўвайшоў у яго
Каўчэг ГОСПАДА».
12 Тады Салямон узносіў цэласпаленьні для ГОСПАДА на ахвярніку ГОСПАДА, які ён пабудаваў
перад прысенкам,
13 і паводле парадку дня кожны ўзносіў [ахвяры] паводле прыказаньня Майсея ў суботы, у
маладзік і на ўрачыстыя сьвяты, тройчы ў год: у сьвята Праснакоў, і ў сьвята Тыдняў, і ў сьвята
Намётаў.
14 І ўстанавіў ён паводле вызначэньня Давіда, бацькі свайго, чэргі сьвятароў для служэньня
іхняга і лявітаў паводле абавязкаў іхніх, хваліць і паслугаваць пры сьвятарах, паводле парадку
дня на кожны дзень, і прыдзьвернікаў паводле чаргі іхняй пры кожнай браме, бо такое
прыказаньне Давіда, чалавека Божага.
15 І не адыходзілі ад прыказаньня валадара адносна сьвятароў і лявітаў у-ва ўсякай справе і
адносна скарбонкі.

16 Гэтак была зроблена ўся праца Салямона ад дня закладаньня Дому ГОСПАДА аж да поўнага
заканчэньня Дому ГОСПАДА.
17 Тады пайшоў Салямон у Эцыён-Гэбэр і ў Элят, які на беразе мора, у зямлі Эдом.
18 І прыслаў яму Хурам праз рукі слугаў сваіх караблі і слугаў, якія былі знаўцамі мора, і яны
паплылі са слугамі Салямона ў Афір, і ўзялі адтуль чатырыста пяцьдзясят талентаў золата, і
прывезьлі да валадара Салямона.

2 Лет 9

1 І валадарка Шэвы пачула пра славу Салямона, і прыйшла ў Ерусалім, каб выспрабаваць
Салямона загадкамі, з вельмі вялікім багацьцем і з вярблюдамі, якія несьлі пахошчы і мноства
золата і каштоўных камянёў. І прыйшла яна да Салямона, і размаўляла з ім пра ўсё, што было
ў яе ў сэрцы.
2 І растлумачыў Салямон ёй усе пытаньні ейныя, і не было нічога невядомага Салямону, што
ён не патлумачыў ёй.
3 І ўбачыла валадарка Шэвы мудрасьць Салямона і дом, які ён пабудаваў,
4 і ежу на стале ягоным, і дамы слугаў ягоных, і паставу паслугачоў ягоных, і адзеньні іхнія;
таксама чашнікаў ягоных і адзеньне іхняе, і сходы, па якіх ён узыходзіў у Дом ГОСПАДА, і была
яна ў захапленьні.
5 І сказала яна валадару: «Праўдзівае тое слова, якое я чула ў зямлі маёй пра справы твае і пра
мудрасьць тваю.
6 І я ня верыла словам пра іх, пакуль не прыйшла і ня ўбачыла вачыма сваімі. І вось, не
распавялі мне нават паловы пра мноства мудрасьці тваёй. Ты пераўзыходзіш тыя весткі, якія
я чула.
7 Шчасьлівыя людзі твае, і шчасьлівыя гэтыя слугі твае, якія заўсёды стаяць перад абліччам
тваім і слухаюць мудрасьць тваю!
8 Няхай будзе дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог твой, Які меў ласку для цябе, каб даць табе
пасад Свой як валадару ў ГОСПАДА, Бога твайго, паводле любові Бога твайго да Ізраіля, каб
умацаваць яго на вякі, і Ён паставіў цябе як валадара над ім, каб чыніць суд і праведнасьць».
9 І яна падаравала валадару сто дваццаць талентаў золата і вялікае мноства пахошчаў і
камянёў каштоўных; і не было такіх пахошчаў, як тыя, што падаравала валадарка Шэвы
валадару Салямону.
10 І таксама слугі Хурама і слугі Салямона, якія прывозілі золата з Афіру, прывезьлі дрэва
сандалавае і камяні каштоўныя.
11 І зрабіў валадар з дрэва сандалавага сходы ў Доме ГОСПАДА і ў доме валадара, і гусьлі, і
псалтыры для сьпевакоў. І ня бачна было падобнага да іх уперад у зямлі Юды.
12 І валадар Салямон даў валадарцы Шэвы ўсё, што яна зажадала і што прасіла, апрача таго, што
яна прывезла валадару. І яна выправілася [назад], і пайшла ў зямлю сваю, яна і слугі ейныя.
13 А вагі золата, якое прыходзіла да Салямона за адзін год, было шэсьцьсот шэсьцьдзясят
шэсьць талентаў золата,
14 акрамя таго, што прыносілі падарожнікі і купцы. І ўсе валадары Арабскія, і намесьнікі Краю
прыносілі золата і срэбра Салямону.
15 І зрабіў Салямон дзьвесьце вялікіх шчытоў з кутага золата, шэсьцьсот [сыкляў] золата ішло
на адзін шчыт,
16 і трыста шчытоў малых з кутага золата, трыста [сыкляў] золата ішло на адзін шчыт; і
паставіў іх валадар у доме з лесу Лібанскага.
17 І зрабіў валадар вялікі пасад з косьці слановай, і пацягнуў яго чыстым золатам,
18 і шэсьць прыступак да пасаду, і падножжа з золата, прымацаванае да пасаду, і парэнчы
паабапал месца сядзеньня, і два ільвы, якія стаяць каля парэнчаў.
19 І дванаццаць ільвоў стаяла там на шасьці прыступках з аднаго і другога боку. Не было такога
зроблена ў-ва ўсіх [іншых] валадарствах.

20 І ўсе начыньні да піцьця ў валадара Салямона [былі] з золата, і ўсе начыньні ў доме з лесу
Лібанскага [былі] з золата шчырага; нічога [не было] са срэбра. Яго ў дні Салямона мелі за
нішто,
21 бо караблі валадара хадзілі ў Таршыш са слугамі Хурама, і раз на тры гады прыходзілі
караблі з Таршышу, і прывозілі золата і срэбра, косьць слановую і малпаў, і паваў.
22 І перавышаў валадар Салямон усіх валадароў зямлі багацьцем і мудрасьцю.
23 І ўсе валадары зямлі шукалі аблічча Салямона, каб паслухаць мудрасьць ягоную, якую
ўлажыў Бог у сэрца ягонае.
24 І прыносілі яны кожны дар свой, начыньні срэбныя, і начыньні залатыя, і адзеньне, і зброю,
і пахошчы, і коней, і мулаў, [адпаведную] рэч з году ў год.
25 І меў Салямон чатыры тысячы стайняў для коней і калясьніцаў і дванаццаць тысячаў
коньнікаў, і памясьціў іх у гарадах калясьнічных і пры валадары ў Ерусаліме.
26 І панаваў ён над усімі валадарамі ад ракі аж да зямлі Філістынскай і аж да межаў Эгіпту.
27 І зрабіў валадар срэбра ў Ерусаліме як камяні, і кедры зрабіў як сікаморы, якіх мноства ў
Шэфэлі.
28 І прыводзілі для Салямона коней з Эгіпту і з усіх земляў.
29 А рэшта дзеяньняў Салямона, першых і апошніх, вось, яны запісаныя ў дзеях Натана
прарока, і ў прароцтве Ахіі з Шыло, і ў відзежах Іддо відушчага пра Ерабаама, сына Навата.
30 І валадарыў Салямон у Ерусаліме над усім Ізраілем сорак гадоў.
31 І супачыў ён з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў горадзе Давіда, бацькі ягонага. І валадарыў
Рэхабаам, сын ягоны, замест яго.

2 Лет 10

1 І пайшоў Рэхабаам у Сыхем, бо ў Сыхем зыйшоўся ўвесь Ізраіль, каб паставіць яго за валадара.
2 І сталася, што пачуў пра гэта Ерабаам, сын Навата, а ён быў у Эгіпце, куды ўцёк ад аблічча
валадара Салямона, і вярнуўся Ерабаам з Эгіпту.
3 І паслалі, і паклікалі яго; і прыйшоў Ерабаам і ўвесь Ізраіль, і прамовілі да Рэхабаама, кажучы:
4 «Бацька твой зрабіў цяжкім ярмо нашае, а ты зрабі лягчэйшымі цяжкія работы бацькі свайго
і ярмо ягонае цяжкае, якое ён узлажыў на нас, і мы будзем служыць табе».
5 І ён сказаў ім: «Яшчэ тры дні і зноў вернецеся да мяне». І адыйшоў народ.
6 І радзіўся валадар Рэхабаам са старшынямі [народу], якія стаялі перад абліччам Салямона,
бацькі ягонага, за жыцьця ягонага, кажучы: «Якім словам вы парадзіце адказаць народу
гэтаму?»
7 І яны прамовілі да яго, кажучы: «Калі ты будзеш добры для народу гэтага, і будзеш зычлівым
да іх, і прамовіш да іх словы добрыя, яны будуць для цябе слугамі ўсе дні».
8 Але ён адкінуў раду старшыняў, якую яны радзілі яму, і радзіўся ў юнакоў, якія расьлі разам
з ім, стоячы перад абліччам ягоным,
9 і сказаў ім: «Што вы парадзіце, [якое] слова сказаць народу гэтаму, які прамовіў да мяне,
кажучы: “Зрабі лягчэйшым ярмо, якое налажыў на нас бацька твой”?»
10 І сказалі яму юнакі, якія расьлі разам з ім, кажучы: «Гэтак адкажы народу, які прамовіў да
цябе, кажучы: “Бацька твой зрабіў цяжкім ярмо нашае, а ты дай палёгку нам”, гэтак адкажы
ім: “Мезенец мой таўсьцейшы за сьцёгны бацькі майго.
11 І цяпер, бацька мой налажыў на вас ярмо цяжкае, а я павялічу ярмо вашае; бацька мой караў
вас пугамі, а я [буду караць] скарпіёнамі”».
12 І прыйшоў Ерабаам і ўвесь народ да Рэхабаама на трэці дзень, як гаварыў валадар, кажучы:
«Вярніцеся да мяне на трэці дзень».
13 І валадар адказаў ім сувора, і адкінуў валадар Рэхабаам раду старшыняў [народу],
14 і прамовіў да іх паводле рады юнакоў, кажучы: «Бацька мой зрабіў цяжкім ярмо вашае, а я
дадам да яго; бацька мой караў вас пугамі, а я [буду караць] скарпіёнамі».
15 І не паслухаў валадар народу, бо гэта было спрычынена Богам, каб ГОСПАД споўніў слова
Сваё, якое прамовіў праз Ахію з Шыло да Ерабаама, сына Навата.

16 І ўвесь Ізраіль убачыў, што валадар яго ня слухае, і адказаў народ валадару, кажучы: «Якая
нашая частка ў Давідзе? Няма нам спадчыны з сынам Есэя! Па намётах сваіх, Ізраіль! Цяпер
глядзі на дом свой, Давідзе!» І разыйшоўся ўвесь Ізраіль у намёты свае.
17 І сыны Ізраіля жылі ў гарадах Юды, і валадарыў над імі Рэхабаам.
18 І паслаў валадар Рэхабаам Гадарама, які [быў наглядчыкам] над данінаю, але сыны Ізраіля
закідалі яго камянямі, і ён памёр. І валадар Рэхабаам пасьпяшаўся сесьці ў калясьніцу, каб
уцячы ў Ерусалім.
19 І адыйшоў Ізраіль ад дому Давіда аж па сёньняшні дзень.

2 Лет 11

1 І прыйшоў Рэхабаам у Ерусалім, і сабраў з дому Юды і Бэн'яміна сто восемдзясят тысячаў
выбраных ваяроў, каб ваяваць з Ізраілем і вярнуць валадарства Рэхабааму.
2 І было слова ГОСПАДА да Шэмаі, чалавека Божага, кажучы:
3 «Скажы Рэхабааму, сыну Салямона, валадару Юды, і ўсяму Ізраілю ў Юдзе і Бэн'яміне,
кажучы:
4 "Гэтак кажа ГОСПАД. Не выходзьце і не ваюйце з братамі сваімі. Вярніцеся кожны ў дом
свой, бо ад Мяне сталася рэч гэтая"». І яны паслухалі словаў ГОСПАДА, і вярнуліся з паходу на
Ерабаама.
5 І жыў Рэхабаам у Ерусаліме, і пабудаваў цьвярдыні ў гарадах Юды.
6 І ён пабудаваў [іх] у Бэтлееме, Этаме, Тэкоа,
7 Бэтцуры, Сахо, Адуляме,
8 Гаце, Марэшы, Зіфе,
9 Адараіме, Ляхішы, Азэцы,
10 Цоры, Аялоне і Хеўроне, якія былі ў Юдзе і Бэн'яміне гарадамі ўмацаванымі.
11 І ўмацаваў ён гэтыя крэпасьці, і даў ім начальнікаў, і склады харчоў, алею і віна,
12 і ў-ва ўсіх гарадах злажыў шчыты і дзіды, і вельмі моцна іх умацаваў. І былі ў яго Юда і
Бэн'ямін.
13 І сьвятары і лявіты, якія [былі] ў-ва ўсёй зямлі Ізраіля, зьбіраліся да яго з усіх межаў сваіх;
14 бо пакінулі Лявіты пашы свае і ўласнасьць сваю, і прыйшлі ў Юду і ў Ерусалім, бо Ерабаам і
сыны ягоныя адсунулі іх ад сьвятарства ГОСПАДАВАГА,
15 і прызначылі ў сябе сьвятароў для ўзгоркаў і для казлоў, і для быкоў, якіх ён зрабіў.
16 А за імі з усіх каленаў Ізраіля тыя, што аддалі сэрцы свае, каб шукаць ГОСПАДА, Бога Ізраіля,
прыходзілі ў Ерусалім, каб складаць ахвяры ГОСПАДУ, Богу бацькоў сваіх.
17 І ўмацавалі яны валадарства Юды, і зрабілі за тры гады мацнейшым Рэхабаама, сына
Салямона, бо хадзілі шляхам Давіда і Салямона гэтыя тры гады.
18 І ўзяў сабе Рэхабаам за жонку Махалят, дачку Ерымота, сына Давіда, і Абігайль, дачку Эліява,
сына Есэя.
19 І яна нарадзіла яму сыноў: Еуша, Шэмарыю і Загама.
20 А пасьля яе ён узяў Мааху, дачку Абсалома, і яна нарадзіла яму Абію, Аттая, Зізу і Шэляміта.
21 І любіў Рэхабаам Мааху, дачку Абсалома, больш за ўсіх жонак сваіх і наложніцаў сваіх, бо
ён узяў васямнаццаць жонак і шэсьцьдзясят наложніцаў, і нарадзіў дваццаць восем сыноў і
шэсьцьдзясят дачок.
22 І паставіў Рэхабаам Абію, сына Маахі, за начальніка над братамі ягонымі, каб паставіць яго
за валадара.
23 І ён дзейнічаў разумна, і разьмясьціў усіх сыноў па ўсіх землях Юды і Бэн'яміна, у-ва ўсіх
гарадах умацаваных, і даў ім шмат харчоў, і пазнаходзіў [ім] шмат жонак.

2 Лет 12

1 І сталася, калі ўмацавалася валадарства Рэхабаама, і ён стаў дужым, пакінуў ён Закон
ГОСПАДА, і ўвесь Ізраіль з ім.
2 І сталася ў пятым годзе валадара Рэхабаама, што ўзыйшоў Шышак, валадар Эгіпту, на
Ерусалім, бо яны былі няверныя ГОСПАДУ,

3 з тысяча двумастамі калясьніцамі і шасьцюдзесяцьцю тысячамі вершнікаў; і не было ліку
народу, які прыйшоў з ім з Эгіпту, — Лібійцам, Суккійцам і Кушанам.
4 І ён здабыў гарады ўмацаваныя ў Юдзе, і прыйшоў да Ерусаліму.
5 І Шэмая прарок прыйшоў да Рэхабаама і князёў Юды, якія сабраліся ў Ерусаліме, [уцякаючы]
перад абліччам Шышака, і сказаў ім: «Гэта кажа ГОСПАД. Вы пакінулі Мяне, і таму Я пакіну
вас у руцэ Шышака».
6 І ўпакорыліся князі Ізраіля і валадар, і сказалі: «Праведны ГОСПАД!»
7 І калі ўбачыў ГОСПАД, што яны ўпакорыліся, было слова ГОСПАДА да Шэмаі, кажучы: «Яны
ўпакорыліся. Я ня выгублю іх і дам неўзабаве ратунак, і ня выльецца гнеў Мой на Ерусалім
праз руку Шышака,
8 бо яны будуць слугамі ягонымі і даведаюцца, што значыць Мне і служыць валадарствам
зямным».
9 І ўзыйшоў Шышак, валадар Эгіпту, на Ерусалім, і забраў скарбы Дому ГОСПАДА і скарбы дому
валадара, і ён узяў усё, і забраў шчыты залатыя, якія зрабіў Салямон.
10 І зрабіў валадар Рэхабаам замест іх шчыты мядзяныя, і аддаў іх у рукі начальніку ганцоў,
якія сьцераглі ўваход у дом валадара.
11 І было, што калі валадар уваходзіў у Дом ГОСПАДА, прыходзілі ганцы, і несьлі іх, а [потым]
адносілі іх у камору ганцоў.
12 І калі ён упакорыўся, тады адвярнуўся ад яго гнеў ГОСПАДА, і Ён ня зьнішчыў яго аж да
загубленьня; і таксама ў Юдзе ішлі справы добра.
13 І ўмацаваўся валадар Рэхабаам у Ерусаліме, і валадарыў; бо сорак адзін год было Рэхабааму,
калі ён заваладарыў, і сямнаццаць гадоў ён валадарыў у Ерусаліме, у горадзе, які выбраў
ГОСПАД з усіх каленаў Ізраіля, каб там было імя Ягонае. А імя маці ягонай — Наама Аманянка.
14 І рабіў ён ліхоту, бо не падрыхтаваў сэрца свайго, каб шукаць ГОСПАДА.
15 І дзеяньні Рэхабаама, першыя і апошнія, вось, яны запісаныя ў дзеях Шэмаі прарока і Іддо
відушчага ў сьпісах радаводных. І [былі] войны ў Рэхабаама з Ерабаамам усе дні.
16 І супачыў Рэхабаам з бацькамі сваімі, і быў пахаваны ў горадзе Давіда. І заваладарыў Абія,
сын ягоны, замест яго.

2 Лет 13

1 У васямнаццатым годзе валадара Ерабаама заваладарыў Абія над Юдаю.
2 Тры гады ён валадарыў у Ерусаліме; імя маці ягонай — Міхая, дачка Урыэля з Гівы. І была
вайна паміж Абіям і Ерабаамам.
3 І скіраваў Абія на вайну войска, ваяроў спраўных чатырыста тысячаў выбранцоў; а Ерабаам
выйшаў супраць яго на вайну з васьмістамі тысячамі выбранцоў, ваяроў мужных.
4 І стаў Абія на вяршыні гары Цэмараім, якая ў гарах Эфраіма, і сказаў: «Паслухайце мяне,
Ерабаам і ўвесь Ізраіль!
5 Ці ж вы ня ведаеце, што ГОСПАД, Бог Ізраіля, даў валадарства Давіду над Ізраілем на вякі, яму
і сынам ягоным, як запавет солі?
6 І паўстаў Ерабаам, сын Навата, слуга Салямона, сына Давіда, і збунтаваўся супраць гаспадара
свайго.
7 І сабраліся да яго людзі пустыя, сыны Бэліяла, і ўмацаваліся супраць Рэхабаама, сына
Салямона. А Рэхабаам быў малады і слабы сэрцам, і ня вытрымаў перад абліччам іхнім.
8 І цяпер вы кажаце, што вытрымаеце перад абліччам валадарства ГОСПАДА, [якое] ў руцэ
сыноў Давіда, і вас вялікае мноства, і з вамі быкі залатыя, якіх Ерабаам зрабіў для вас як багоў.
9 Ці ж ня вы выгналі сьвятароў ГОСПАДА, сыноў Аарона, і лявітаў, і нарабілі для сябе сьвятароў,
як [робяць] народы земляў [гэтых]? Кожны, хто прыходзіць, каб напоўніць руку сваю, з цялём,
маладым бычком і з сямёма баранамі, становіцца сьвятаром для таго, хто ня ёсьць Богам.
10 А мы [маем] ГОСПАДА, Бога нашага, і мы не пакінулі Яго, і сьвятары, якія служаць ГОСПАДУ
— сыны Аарона, і лявіты пры працы сваёй.

11 І яны складаюць ГОСПАДУ цэласпаленьні кожную раніцу, і кожны вечар — пахкае кадзіла, і
хлябы пакладныя — на стале чыстым, і сьвечнік залаты і лямпы ягоныя запальваюць кожны
вечар, бо мы захоўваем загады ГОСПАДА, Бога нашага, а вы пакінулі Яго.
12 І вось, з намі на чале Бог, і сьвятары Ягоныя, і трубы гучныя, каб трубіць супраць вас. Сыны
Ізраіля, не ваюйце з ГОСПАДАМ, Богам бацькоў вашых, бо не пераможаце».
13 І Ерабаам выправіў засаду, каб зайшла ззаду іх, і быў ён перад абліччам Юды, а засада —
ззаду іх.
14 І павярнуўся Юда, і вось, у іх бітва сьпераду і ззаду. І клікалі яны да ГОСПАДА, і сьвятары
затрубілі ў трубы.
15 І закрычалі людзі Юды. І сталася, калі закрычалі людзі Юды, Бог ударыў Ерабаама і ўсяго
Ізраіля перад абліччам Абіі і Юды.
16 І ўцяклі сыны Ізраіля перад абліччам Юды, і аддаў іх Бог у руку іхнюю.
17 І ўдарылі іх Абія і народ ягоны паразаю вялікаю, і ўпала забітых у Ізраілі пяцьсот тысячаў
мужоў выбраных.
18 І былі ўпакораныя сыны Ізраіля ў той час, і былі ўмацаваныя сыны Юды, бо яны абапіраліся
на ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх.
19 І гнаўся Абія за Ерабаамам, і здабыў у яго гарады: Бэтэль і вёскі ягоныя, і Ешану і вёскі ейныя,
і Эфрон і вёскі ягоныя.
20 І не аднавіў ужо сілу Ерабаам у дні Абіі. І ўдарыў яго ГОСПАД, і ён памёр.
21 І ўмацаваўся Абія, і ўзяў чатырнаццаць жонак, і нарадзіў дваццаць два сыны і шаснаццаць
дачок.
22 А рэшта дзеяньняў Абіі, і шляхі ягоныя, і словы ягоныя запісаныя ў гісторыі прарока Іддо.

2 Лет 14

1 І супачыў Абія з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў горадзе Давіда. І заваладарыў Аса, сын ягоны,
пасьля яго. У дні ягоныя была ў супакоі зямля дзесяць гадоў.
2 І рабіў Аса добрае і слушнае ў вачах ГОСПАДА, Бога свайго.
3 І прыбраў ён ахвярнікі чужых [багоў], і ўзгоркі, і разьбіў слупы, і пасьсякаў [сьвятыя] гаі.
4 І сказаў да Юды, каб шукалі ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, і выконвалі Закон і прыказаньні.
5 І прыбраў ён у-ва ўсіх гарадах Юды ўзгоркі і выявы сонца. І было ў супакоі валадарства перад
абліччам ягоным.
6 І пабудаваў ён гарады ўмацаваныя ў Юдзе, бо была ў супакоі зямля, і не было ў яго вайны ў
тыя гады, бо ГОСПАД даў яму супакой.
7 І сказаў ён Юдзе: «Пабудуем гарады гэтыя, і аточым [іх] мурамі і вежамі, брамамі і заваламі,
пакуль зямля наша перад абліччам нашым, бо мы шукалі ГОСПАДА, Бога нашага. Мы шукалі
[Яго], і Ён даў нам супакой навокал». І яны будавалі, і мелі посьпех.
8 І было ў Асы войска: тых, якія носяць вялікія шчыты і дзіды — трыста тысячаў, і з Бэн'яміна
тых, якія носяць шчыты і нацягваюць лук — дзьвесьце восем тысячаў, усе яны — ваяры
мужныя.
9 І выйшаў на іх Зэрах Кушанін з войскам, [якое мела] тысячу тысячаў і трыста калясьніцаў, і
дайшоў да Марэшы.
10 І выйшаў Аса перад аблічча ягонае, і пашыхтаваліся на бітву ў даліне Цэфат каля Марэшы.
11 І клікаў Аса да ГОСПАДА, Бога свайго, і сказаў: «ГОСПАДЗЕ, няма [нікога], акрамя Цябе, каб
дапамагчы шматлікаму, [або таму, хто] ня мае сілы. Дапамажы нам, ГОСПАДЗЕ, Божа наш, бо
мы на Цябе спадзяемся і ў імя Тваё мы выйшлі супраць мноства гэтага. ГОСПАДЗЕ, Ты — Бог
наш! Няхай ня спыніць Цябе чалавек».
12 І пабіў ГОСПАД Кушанаў перад абліччам Асы і перад абліччам Юды, і ўцякалі Кушане.
13 І гнаў іх Аса і народ, які быў з ім, аж да Герару, і падалі Кушане, ажно ў іх нікога не [засталося]
жывога, бо яны былі зьнішчаныя перад абліччам ГОСПАДА і перад абліччам табару Ягонага. І
панесьлі яны здабычы вялікае мноства.

14 І пабілі яны ўсе гарады вакол Герару, бо напаў на іх жах перад ГОСПАДАМ; і рабавалі ўсе
гарады, бо шмат здабычы было ў іх.
15 І таксама намёты [пастухоў] статкаў яны зьнішчылі, і забралі мноства авечак і вярблюдаў, і
вярнуліся ў Ерусалім.

2 Лет 15

1 Дух Божы быў на Азарыі, сыне Адэда.
2 І выйшаў ён перад аблічча Асы, і сказаў яму: «Паслухайце мяне, Аса і ўвесь Юда і Бэн'ямін.
ГОСПАД з вамі, калі вы будзеце з Ім; і калі будзеце шукаць Яго, Ён дасьць вам знайсьці Сябе;
калі ж вы пакінеце Яго, Ён пакіне вас.
3 І шмат дзён Ізраіль быў бяз Бога праўдзівага, і без сьвятара-вучыцеля, і без Закону.
4 І зьвярнуліся яны ў прыгнёце сваім да ГОСПАДА, Бога Ізраіля, і шукалі Яго, і Ён даў ім знайсьці
Сябе.
5 А ў тыя часы не было супакою ані таму, хто выйшаў, ані таму, хто прыйшоў, бо вялікая
трывога была ў-ва ўсіх жыхароў зямлі.
6 І ваяваў народ супраць народу, і горад супраць гораду, таму што Бог бянтэжыў іх усякімі
бядотамі.
7 Але вы будзеце моцныя, і няхай ня слабнуць рукі вашыя, бо ёсьць нагарода за ўчынкі вашыя».
8 І калі Аса пачуў словы гэтыя і прароцтва [сына] Абэда, прарока, ён умацаваўся і выкінуў
брыдоту з усёй зямлі Юды, і з Бэн'яміна, і з гарадоў, якія ён здабыў на гары Эфраіма, і аднавіў
ахвярнік ГОСПАДА, які перад прысенкам ГОСПАДА.
9 І сабраў ён усяго Юду і Бэн'яміна, і тых, што жылі з імі з Эфраіма, з Манасы і з Сымона, бо
мноства іх перайшло з Ізраіля, калі яны ўбачылі, што ГОСПАД, Бог ягоны, з ім.
10 І сабраліся яны ў Ерусаліме ў трэці месяц пятнаццатага году валадараньня Асы.
11 І ахвяравалі яны ГОСПАДУ ў той дзень са здабычы, якую прывялі, з валоў — сямсот і з авечак
— сем тысячаў,
12 і ўвайшлі ў запавет, каб шукаць ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, усім сэрцам сваім і ўсёй душою
сваёй.
13 І кожны, хто ня будзе шукаць ГОСПАДА, Бога Ізраіля, мае памерці, ад малога аж да вялікага
і ад мужчыны аж да жанчыны.
14 І прысягалі яны ГОСПАДУ голасам вялікім з гуканьнем, з гукам] трубаў і [гукам] рагоў.
15 І радаваўся ўвесь Юда з прысягі гэтай, бо яны прысягалі ўсім сэрцам сваім, і ўсім жаданьнем
сваім шукалі Яго, і Ён даў ім знайсьці Сябе. І даў ім ГОСПАД супакой навокал.
16 І нават Мааху, маці Асы, валадар пазбавіў годнасьці валадарскай за тое, што яна зрабіла
ідала Астарты. І пасек Аса ідала, і патоўк, і спаліў каля ручая Кедрон.
17 Але ўзгоркі не былі зьнішчаныя ў Ізраілі, аднак сэрца Асы было цалкам [з Госпадам] усе дні
ягоныя.
18 І прынёс ён у Дом Божы рэчы пасьвячоныя бацькі свайго і рэчы пасьвячоныя свае — срэбра
і золата, і посуд.
19 І не было вайны да трыццаць пятага году валадараньня Асы.

2 Лет 16

1 У трыццаць шостым годзе валадараньня Асы пайшоў Бааша, валадар Ізраіля, супраць Юды, і
пачаў будаваць Раму, каб не дазволіць выходзіць ад Асы, валадара Юды, ані прыходзіць.
2 І вынес Аса срэбра і золата са скарбніцы Дому ГОСПАДА і дому валадара, і паслаў да Бэн-
Гадада, валадара Сірыі, які жыў у Дамаску, кажучы:
3 «Запавет [ёсьць] паміж мною і табою, паміж бацькам маім і бацькам тваім. Вось, я пасылаю
табе срэбра і золата. Пайдзі, паруш запавет твой з Баашам, валадаром Ізраілю, і ён адступіцца
ад мяне».
4 І паслухаў Бэн-Гадад валадара Асу, і паслаў начальнікаў войска, якія ў яго, супраць гарадоў
Ізраіля, і яны зруйнавалі Іён, Дан, Абэль-Маім і ўсе сьвірны [запасаў] у гарадах Нэфталі.
5 І сталася, калі пачуў [пра гэта] Бааша, ён пакінуў будаваць Раму і спыніў працу сваю.

6 І валадар Аса сабраў усяго Юду, і яны вынесьлі камяні з Рамы і дрэвы ейныя, якія ўжываў
Бааша на будоўлю, і ён пабудаваў з іх Гіву і Міцпу.
7 У той час прыйшоў Ханані, відушчы, да Асы, валадара Юды, і сказаў яму: «За тое, што ты
абапіраўся на валадара Сірыі, а не абапіраўся на ГОСПАДА, Бога твайго, войска валадара Сірыі
ўцякло з рукі тваёй.
8 Ці не былі Кушане і Лібійцы войскам вялікім з калясьніцамі і вершнікамі вельмі шматлікімі?
Але калі ты абапёрся на ГОСПАДА, Ён аддаў іх у руку тваю.
9 Бо ГОСПАД вачыма Сваімі абыходзіць усю зямлю, каб умацоўваць тых, чыё сэрца цалкам з
Ім. Дрэнна ты зрабіў. Бо цяпер будуць у цябе войны».
10 І зазлаваўся Аса на відушчага, і кінуў яго ў вязьніцу, бо ён быў загневаны на яго з гэтай
прычыны. І ўціскаў Аса [некаторых] з народу ў гэты час.
11 І вось дзеяньні Асы, першыя і апошнія, і вось, яны запісаныя ў Кнізе валадароў Юды і Ізраілю.
12 І захварэў Аса на ногі ў трыццаць дзявятым годзе валадараньня свайго, і хвароба ягоная
была цяжкая, але нават у хваробе сваёй ён шукаў ня ГОСПАДА, але лекараў.
13 І супачыў Аса з бацькамі сваімі, і памёр у сорак першым годзе валадараньня свайго.
14 І пахавалі яго ў магіле ягонай, якую ён выкапаў сабе ў горадзе Давіда; і палажылі
яго на ложку, які быў напоўнены пахошчамі і рознымі масьцямі, прыгатаванымі работай
мяшальніка масьцяў, і спалілі іх для яго агнём вельмі вялікім.

2 Лет 17

1 І заваладарыў Язафат, сын ягоны, пасьля яго; і ён умацаваўся супраць Ізраіля.
2 І паставіў ён войска ў-ва ўсіх гарадах Юды, і паставіў залогі ў зямлі Юды і ў гарадах Эфраіма,
якія здабыў Аса, бацька ягоны.
3 І быў ГОСПАД з Язафатам, бо ён хадзіў першымі шляхамі Давіда, бацькі свайго, і не шукаў
Баалаў,
4 бо ён шукаў Бога бацькі свайго, і хадзіў паводле прыказаньняў Ягоных, а не паводле ўчынкаў
Ізраіля.
5 І ўмацаваў ГОСПАД валадарства ў руцэ ягонай, і даваў увесь Юда дары Язафату, і было ў яго
шмат багацьця і славы.
6 І ўзьнялося сэрца ягонае на шляхах ГОСПАДА; і ён таксама прыбраў узгоркі і Астартаў у Юдзе.
7 А ў трэці год валадараньня свайго ён паслаў князёў сваіх: Бэнхаіла, Абадыю, Захарыю,
Натанаэля і Міхаю, каб яны вучылі ў гарадах Юды.
8 І з імі лявітаў: Шэмаю, Нэтанію, Зэвадыю, Асаэля, Шэмірамота, Еганатана, Адонію, Товію і
Тоў-Адонію, лявітаў, і з імі Элішаму і Егарама, сьвятароў.
9 І яны вучылі ў Юдзе, і з імі [была] кніга Закону ГОСПАДА; і абыходзілі яны ўсе гарады Юды, і
навучалі ў іх.
10 І быў страх ГОСПАДА на ўсіх валадарствах земляў, якія навокал Юды, і не ваявалі з Язафатам.
11 І ад Філістынцаў прыносілі Язафату дары і срэбра як даніну; таксама Арабы прыганялі да
яго авечак, бараноў сем тысячаў сямсот і казлоў сем тысячаў сямсот.
12 І ўзьвялічыўся Язафат надзвычайна, і пабудаваў ён у Юдзе крэпасьці і гарады сьвірнаў.
13 Шмат было ў яго працаўнікоў у гарадах Юды, і людзей вайсковых, ваяроў мужных у
Ерусаліме.
14 І вось попіс іхні паводле дамоў бацькоў іхніх. У Юды князі тысячаў: Адна, князь, і з ім трыста
тысячаў ваяроў мужных;
15 і пры руцэ ягонай Егаханан, князь, і з ім дзьвесьце восемдзясят тысячаў;
16 і пры руцэ ягонай Амасія, сын Зіхры, які прысьвяціў сябе ГОСПАДУ, і з ім дзьвесьце тысячаў
ваяроў мужных.
17 У Бэн'яміна: ваяр мужны Эліяда, і з ім узброеных лукам і шчытом дзьвесьце тысячаў;
18 і пры руцэ ягонай Егазавад, і з ім сто восемдзясят тысячаў узброенага войска.
19 Гэта тыя, якія служылі пры валадары, акрамя тых, якіх валадар паставіў у гарадах
умацаваных у-ва ўсім Юдзе.

2 Лет 18

1 І было ў Язафата шмат багацьця і славы; і ён пасваячыўся з Ахавам.
2 І пайшоў ён праз некалькі гадоў да Ахава ў Самарыю. І ахвяраваў Ахаў мноства авечак і валоў
для яго і для людзей, што з ім, і намовіў яго ісьці на Рамот Гілеадзкі,
3 І сказаў Ахаў, валадар Ізраіля, Язафату, валадару Юды: «Ці пойдзеш са мною на Рамот
Гілеадзкі?» Той сказаў яму: «Як ты, так і я; як народ твой, так і народ мой; і я [буду] з табою
на вайне».
4 І сказаў Язафат валадару Ізраіля: «Спытайся сёньня слова ГОСПАДА».
5 І сабраў валадар Ізраіля прарокаў чатырыста чалавек, і сказаў ім: «Ці ісьці нам на вайну на
Рамот Гілеадзкі, ці стрымацца?» І яны сказалі: «Ідзі, і Бог аддасьць [яго] ў руку валадара».
6 І сказаў Язафат: «Ці няма тут яшчэ прарока ГОСПАДА? І мы спытаемся ў яго».
7 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Ёсьць адзін чалавек, каб праз яго спытацца ў ГОСПАДА;
але я ненавіджу яго, бо ён не прарочыць пра мяне добрае, але ўсе дні свае [прарочыць] ліхое.
Гэта Міхей, сын Імлі». І сказаў Язафат: «Не кажы так, валадару».
8 І паклікаў валадар Ізраіля аднаго эўнуха, і сказаў: «Прывядзі хутчэй Міхея, сына Імлі».
9 А валадар Ізраіля і Язафат, валадар Юды, сядзелі кожны на пасадзе сваім, апранутыя ў шаты
валадарскія. І сядзелі яны каля ўваходу ў брамы Самарыі; і ўсе прарокі прарочылі перад імі.
10 І зрабіў сабе Сэдэкія, сын Кенааны, рогі жалезныя, і сказаў: «Гэта кажа ГОСПАД: “Імі будзеш
бадаць Сірыйцаў, пакуль ня выгубіш іх”».
11 І ўсе прарокі прарочылі, кажучы: «Ідзі на Рамот Гілеадзкі, і будзеш мець посьпех, і аддасьць
ГОСПАД [яго] ў руку валадара».
12 А пасланец, які пайшоў клікаць Міхея, прамовіў да яго, кажучы: «Вось, словы прарокаў
аднолькава добрыя для валадара. І няхай слова тваё, прашу, будзе, як аднаго з іх, і ты гавары
добрае».
13 І сказаў Міхей: «Як жывы ГОСПАД! Што скажа мне Бог, тое я буду гаварыць».
14 І прыйшоў ён да валадара, і сказаў яму валадар: «Міхею, ці ісьці нам на вайну на Рамот
Гілеадзкі, ці стрымацца?» І той сказаў: «Ідзіце, і будзеце мець посьпех, і яны будуць аддадзены
ў рукі вашыя».
15 І сказаў яму валадар: «Колькі разоў я павінен прысягаю абавязваць цябе, каб ты гаварыў
мне толькі праўду ў імя ГОСПАДА?»
16 І ён сказаў: «Я бачыў увесь Ізраіль, расьцярушаны на гарах, як авечкі, у якіх няма пастуха. І
сказаў ГОСПАД: “Няма ў іх гаспадара, няхай вернуцца кожны ў дом свой у супакоі”».
17 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Ці не казаў я табе, што ён не прарочыць мне добрае, але
толькі ліхое?»
18 І сказаў [Міхей]: «Таму слухайце слова ГОСПАДА. Я бачыў ГОСПАДА, Які сядзеў на пасадзе
Сваім, і ўсё войска нябеснае стаяла праваруч і леваруч Яго.
19 І сказаў ГОСПАД: “Хто намовіць Ахава, валадара Ізраіля, каб ён пайшоў і загінуў у Рамоце
Гілеадзкім?” І казалі, і адзін казаў так, а другі казаў гэтак.
20 І выступіў [адзін] дух, і стаў перад абліччам ГОСПАДА, і сказаў: “Я намоўлю”. І сказаў яму
ГОСПАД: “Як?”
21 Той сказаў: “Я выйду і буду духам хлусьлівым у вуснах усіх прарокаў ягоных”. І сказаў
[Госпад]: “Ты намовіш, і атрымаецца ў цябе; ідзі і зрабі гэтак”.
22 І цяпер, вось, ГОСПАД даў духа хлусьлівага ў вусны прарокаў тваіх, і ГОСПАД прамовіў пра
цябе ліхое».
23 І наблізіўся Сэдэкія, сын Кенаана, і ўдарыў Міхея па шчацэ, і сказаў: «Якім гэта шляхам
адыйшоў ад мяне Дух ГОСПАДА, каб гаварыць з табою?»
24 І сказаў Міхей: «Вось, ты ўбачыш [гэта] ў той дзень, калі будзеш бегаць з пакою ў пакой, каб
схавацца».
25 І сказаў валадар Ізраіля: «Вазьміце Міхея, і завядзіце яго да Амона, начальніка гораду, і да
Ёаша, сына валадарскага,

26 і скажыце: “Гэта сказаў валадар. Пасадзіце яго ў вязьніцу і давайце яму хлеб скупа і ваду
скупа, пакуль я вярнуся ў супакоі”».
27 І сказаў Міхей: «Калі ты сапраўды вернешся ў супакоі, не прамаўляў ГОСПАД праз мяне». І
сказаў: «Слухайце, усе людзі!»
28 І пайшоў валадар Ізраіля і Язафат, валадар Юды, на Рамот Гілеадзкі.
29 І сказаў валадар Ізраіля Язафату: «Я пераапрануся і пайду ў бітву, а ты апрані шаты свае». І
пераапрануўся валадар Ізраільскі, і яны пайшлі ў бітву.
30 А валадар Сірыі загадаў начальнікам калясьніцаў сваіх, якія былі ў яго, кажучы: «Ня біцеся
ані з малым, ані з вялікім, але толькі з валадаром Ізраіля».
31 І сталася, што ўбачылі начальнікі калясьніцаў Язафата і сказалі: «Гэта валадар Ізраіля», — і
атачылі яго, каб біцца з ім. І закрычаў Язафат, і ГОСПАД дапамог яму, і адвёў іх Бог ад яго.
32 І сталася, што ўбачылі начальнікі калясьніцаў, што гэта не валадар Ізраіля, і павярнулі ад
яго.
33 І адзін чалавек ненарокам нацягнуў лук і трапіў у валадара Ізраіля паміж поясам і
панцырам. І той сказаў возьніку: «Павярні руку тваю і вывязі мяне з табару, бо я паранены».
34 І разгарэлася бітва ў той дзень, і валадар Ізраіля стаяў на калясьніцы супраць Сірыйцаў аж
да вечара, і памёр у часе заходу сонца.

2 Лет 19

1 І вярнуўся Язафат, валадар Юды, у супакоі ў дом свой, у Ерусалім.
2 І выйшаў перад аблічча ягонае Егу, сын Ханані, відушчы, і сказаў валадару Язафату: «Ці
будзем дапамагаць бязбожніку і любіць тых, якія ненавідзяць ГОСПАДА? За гэта гнеў на табе
ад аблічча ГОСПАДА.
3 Аднак і рэч добрая знойдзена ў табе, бо ты зьнішчыў Астартаў у зямлі гэтай і падрыхтаваў
сэрца сваё шукаць Бога».
4 І жыў Язафат у Ерусаліме. І ён вярнуўся, і выходзіў да народу ад Бээр-Шэвы аж да гары
Эфраіма, і навяртаў іх да ГОСПАДА, Бога бацькоў іхніх.
5 І паставіў ён судзьдзяў у зямлі ў-ва ўсіх гарадах Юды, якія ўмацаваў, для кожнага гораду.
6 І сказаў судзьдзям: «Глядзіце, што вы робіце; бо вы судзіце ня дзеля чалавека, але дзеля
ГОСПАДА, і Ён з вамі ў справе суду.
7 І цяпер, няхай страх перад ГОСПАДАМ будзе на вас. Зважайце на тое, бо няма беззаконьня ў
ГОСПАДА, Бога нашага, ані зважаньня на аблічча, ані браньня хабараў».
8 І таксама ў Ерусаліме паставіў Язафат [судзьдзяў] з лявітаў, са сьвятароў і з галоваў [дамоў]
бацькоў Ізраіля для суду ГОСПАДА і для [вырашэньня] спрэчак. І яны вярнуліся ў Ерусалім.
9 І загадаў ён ім, кажучы: «Гэтак будзеце рабіць у страху перад ГОСПАДАМ, верна і са шчырым
сэрцам.
10 І ў-ва ўсякай спрэчцы, якая прыйдзе да вас ад братоў вашых, што жывуць у гарадах
сваіх, адносна крыві і крыві, адносна Закону і прыказаньня, адносна пастановаў і судоў, вы
перасьцерагайце іх, каб яны не грашылі супраць ГОСПАДА і каб гнеў [Ягоны] не прыйшоў на
вас і на братоў вашых. Гэтак рабіце і не саграшыце.
11 І вось, Амарыя, сьвятар, [будзе] галавой над вамі ў кожнай справе ГОСПАДА, а Зэвадыя, сын
Ізмаэля, правадыр дому Юды, [будзе] над усімі справамі валадара, а таксама лявіты [будуць]
пісарамі перад абліччам вашым. Будзьце мужныя і рабіце. І няхай ГОСПАД будзе з добрым».

2 Лет 20

1 І сталася пасьля гэтага, прыйшлі сыны Мааву і сыны Амона, і з імі Мэуняне ваяваць з
Язафатам.
2 І прыйшлі, і паведамілі Язафату, кажучы: «Ідзе на цябе вялікае мноства з таго боку мора, з
Сірыі, і вось, яны ў Хацацон-Тамары, гэта Эн-Гэды».
3 І спалохаўся Язафат, і зьвярнуў аблічча сваё, каб шукаць ГОСПАДА, і абвясьціў пост у-ва ўсім
Юдзе.
4 І сабраўся Юда шукаць ГОСПАДА, таксама з усіх гарадоў Юды прыйшлі шукаць ГОСПАДА.

5 І стаў Язафат у царкве Юды і Ерусаліму ў Доме ГОСПАДА перад новым панадворкам,
6 і сказаў: «ГОСПАДЗЕ, Божа бацькоў нашых! Ці ня Ты — Бог у небе? І Ты пануеш над усімі
валадарствамі народаў, і ў руцэ Тваёй сіла і моц, і ніхто ня можа супрацівіцца Табе!
7 Ці ня Ты, Божа наш, выгнаў жыхароў зямлі гэтай перад абліччам народу Твайго, Ізраіля, і
аддаў яе насеньню Абрагама, сябра Твайго, на вякі?
8 І яны пасяліліся ў ёй, і пабудавалі Табе ў ёй сьвятыню для імя Твайго, кажучы:
9 “Калі прыйдзе на нас бяда: меч, пакараньне, пошасьць і голад, мы станем перад Домам гэтым
і перад абліччам Тваім, бо імя Тваё ў Доме гэтым, і будзем клікаць да Цябе ў горы нашым, і Ты
пачуеш, і выратуеш!”
10 І цяпер, вось, сыны Амона, Мааву і [жыхары] гары Сэір, праз якіх Ты не дазволіў Ізраілю
перайсьці, калі ён выходзіў з зямлі Эгіпецкай, і яны абмінулі іх, і ня зьнішчылі іх.
11 І вось, яны плацяць нам тым, што прыйшлі выгнаць нас са спадчыны Тваёй, якую Ты даў
нам як спадчыну.
12 Божа наш! Ці Ты ня будзеш судзіць іх? Бо няма ў нас сілы супраць мноства гэтага, якое
прыйшло на нас, і мы ня ведаем, што рабіць, але да Цябе вочы нашыя!»
13 І ўвесь Юда стаяў перада абліччам ГОСПАДА, таксама дзеці іхнія, жонкі іхнія і сыны іхнія.
14 І на Яхазіэля, сына Захарыі, сына Бэнаі, сына Еіэля, сына Маттаніі, лявіта з сыноў Асафа,
зыйшоў Дух ГОСПАДА сярод царквы.
15 І ён сказаў: «Слухайце, увесь Юда і жыхары Ерусаліму, і валадар Язафат! Гэта кажа вам
ГОСПАД: “Ня бойцеся і не палохайцеся мноства гэтага вялікага, бо ня вашая вайна гэтая, але
Божая.
16 Заўтра зыйдзіце супраць іх. Вось, яны ўзыходзяць на ўзвышша Цыц, і вы знойдзеце іх на
канцы даліны, перад пустыняй Еруэль.
17 Ня вашая бітва гэтая! Вы станьце, стойце і глядзіце на збаўленьне ад ГОСПАДА для вас, Юда і
Ерусалім!” Ня бойцеся і не палохайцеся. Заўтра выйдзіце перад аблічча іхняе, і ГОСПАД будзе
з вамі».
18 І пакланіўся Язафат абліччам да зямлі, і ўвесь Юда і жыхары Ерусаліму ўпалі перад абліччам
ГОСПАДА, каб пакланіцца ГОСПАДУ.
19 І ўсталі лявіты з сыноў Кегата і з сыноў Караха, каб хваліць ГОСПАДА, Бога Ізраіля, голасам
вялікім і ўзьнятым.
20 І ўсталі яны рана раніцаю, і вырушылі ў пустыню Тэкоа. І калі яны выходзілі, устаў Язафат і
сказаў: «Паслухайце мяне, Юда і жыхары Ерусаліму! Верце ў ГОСПАДА, Бога вашага, і будзеце
непахісныя; верце прарокам Ягоным, і будзеце мець посьпех».
21 І, радзіўся ён з народам, і паставіў сьпевакоў для ГОСПАДА, тых, якія хваляць у велічы
сьвятасьці, каб яны ішлі перад узброенымі і казалі: «Выслаўляйце ГОСПАДА, бо на вякі
міласэрнасьць Ягоная!»
22 І ў той час, калі яны пачалі сьпевы і хвалу, ГОСПАД учыніў нязгоду ў сыноў Амона, Мааву і
[жыхароў] гары Сэір, якія выйшлі супраць Юды, і яны былі пабітыя.
23 І паўсталі сыны Амона і Мааву на жыхароў гары Сэір, каб выбіць і зьнішчыць; а калі скончылі
з жыхарамі Сэіру, паўсталі адны на адных, каб зьнішчыць.
24 І Юда прыйшоў да вартавой вежы ў пустыні, і зьвярнуўся да мноства гэтага, і вось, мёртвыя,
якія ляжаць на зямлі, і няма ўратаванага.
25 І прыйшоў Язафат і народ ягоны, каб зрабаваць здабычу іхнюю, і знайшлі ў іх мноства
маёмасьці, і мёртвых, і начыньняў каштоўных, і набралі сабе [столькі], што не маглі несьці. І
тры дні яны рабавалі здабычу, бо яе было шмат.
26 А ў чацьвёрты дзень яны сабраліся ў даліне Бэраха, бо там яны дабраславілі ГОСПАДА. Дзеля
гэтага назвалі імя месца таго даліна Бэраха аж да сёньня.
27 І павярнуліся ўсе мужы Юды і Ерусаліму, і Язафат на чале іх, каб вярнуцца ў Ерусалім з
радасьцю, бо ўзрадваў іх ГОСПАД [збаўленьнем] ад ворагаў іхніх.
28 І прыйшлі яны ў Ерусалім з псалтырамі, гусьлямі і трубамі ў Дом ГОСПАДА.
29 І быў страх Божы на ўсіх валадарствах зямлі гэтай, калі яны пачулі, што ГОСПАД ваяваў
супраць ворагаў Ізраіля.

30 І было ў супакоі валадарства Язафата, і даў яму Бог ягоны супакой навакол.
31 І валадарыў Язафат над Юдам. Меў ён трыццаць пяць гадоў, калі заваладарыў, і валадарыў дваццаць пяць гадоў у Ерусаліме. Імя маці ягонай — Азува, дачка Шыльхі.
32 І хадзіў ён шляхам бацькі свайго Асы, і не ўхіляўся з яго, робячы тое, што слушнае ў вачах ГОСПАДА.
33 Толькі ўзгоркі не былі прыбраныя, і народ яшчэ не падрыхтаваў сэрца свайго [быць] пры Богу бацькоў сваіх.
34 А рэшта дзеяньняў Язафата, першыя і апошнія, вось, яны запісаныя ў дзеях Егу, сына Ханані, якая далучана да Кнігі валадароў Ізраіля.
35 А пасьля гэтага Язафат, валадар Юды, злучыўся з Ахазіем, валадаром Ізраіля, які дзейнічаў злачынна.
36 І ён злучыўся з ім, каб будаваць караблі і хадзіць у Таршыш. І яны будавалі караблі ў Эцыён-Гэбэры.
37 І прарочыў Эліэзэр, сын Дадавіі з Марэшы, пра Язафата, кажучы: «За тое, што ты злучыўся з Ахазіем, ГОСПАД зруйнуе працу тваю». І разьбіліся караблі, і не маглі ісьці ў Таршыш.

2 Лет 21

1 І супачыў Язафат з бацькамі сваімі, і быў пахаваны з бацькамі сваімі ў горадзе Давіда. І заваладарыў Егарам, сын ягоны, пасьля яго.
2 І [былі] ў яго браты, сыны Язафата: Азарыя, Ехіэль, Захарыя, Азарыя, Міхаэль і Шэфатыя; усе яны — сыны Язафата, валадара Ізраіля.
3 І даў ім бацька іхні вялікія дары, срэбра і золата, і каштоўныя рэчы, і гарады ўмацаваныя ў Юдзе. А валадараньне аддаў Егараму, бо ён першародны.
4 І стаў Егарам на валадарства бацькі свайго, і ўмацаваўся, і забіў усіх братоў сваіх мячом, і таксама [некаторых] з князёў Ізраіля.
5 Трыццаць два гады было Егараму, калі ён пачаў валадарыць, і восем гадоў ён валадарыў у Ерусаліме.
6 І хадзіў ён шляхам валадароў Ізраіля, як рабіў дом Ахава, бо дачка Ахава была жонкаю ягонай, і рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА.
7 Але не хацеў ГОСПАД выгубіць дом Давіда дзеля запавету, які Ён заключаў з Давідам, і дзеля таго, што Ён абяцаў даць сьветач яму і сынам ягоным на ўсе дні.
8 У дні ягоныя выйшаў Эдом з-пад рукі Юды, і яны паставілі над сабою валадара.
9 І пайшоў Егарам з князямі сваімі, і ўсе калясьніцы ягоныя з ім, і сталася, што ён устаў уначы, і разьбіў Эдомцаў, якія атачалі яго, і начальнікаў калясьніцаў [іхніх].
10 Але выйшаў Эдом з-пад рукі Юды аж да дня гэтага. У той час выйшла таксама Лібна з-пад рукі ягонай, бо ён пакінуў ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх.
11 Таксама ён рабіў узгоркі ў гарах Юды, і зрабіў распусьнікамі жыхароў Ерусаліму, і зьвёў Юду.
12 І прыйшоў да яго ліст ад Ільлі прарока, кажучы: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Давіда, бацькі твайго: “За тое, што ты не хадзіў шляхамі Язафата, бацькі твайго, ані шляхамі Асы, валадара Юды,
13 а пайшоў шляхам валадароў Ізраіля і зрабіў распусьнікамі Юду і жыхароў Ерусаліму, як рабіў распусьнікамі [Ізраіля] дом Ахава; і братоў тваіх, дом бацькі твайго, якія былі лепшыя за цябе, ты забіў;
14 вось, ударыць ГОСПАД плягай вялікай народ твой, і сыноў тваіх, і жонак тваіх, і ўсю маёмасьць тваю.
15 А ты захварэеш моцна на хваробу нутра, аж будзе выходзіць [з цябе] нутро тваё з прычыны хваробы дзень пры дні”».
16 І ўзбудзіў ГОСПАД на Егарама дух Філістынцаў і Арабаў, якія былі пад рукою Кушанаў,
17 і яны пайшлі на Юду, і ўвайшлі ў яго, і захапілі ўсю маёмасьць, што была ў доме валадара, а таксама сыноў ягоных, і жонак ягоных; і не засталося ў яго сына, акрамя Егаахаза, найменшага з сыноў ягоных.

18 І пасьля ўсяго гэтага ўдарыў ГОСПАД нутро ягонае хваробаю невылечнаю.
19 І сталася так дзень пры дні, а пад канец другога году выйшла нутро ягонае з прычыны
хваробы ягонай, і ён памёр у ліхой немачы; і народ ягоны не рабіў для яго [пахкіх паленьняў],
як рабілі паленьне для бацькоў ягоных.
20 Трыццаць два [гады] было яму, калі пачаў валадарыць, і ён валадарыў у Ерусаліме восем
гадоў, і адыйшоў, і [ніхто] не шкадаваў. Пахавалі яго ў горадзе Давіда, але не ў магілах
валадарскіх.

2 Лет 22

1 І паставілі жыхары Ерусаліму за валадара пасьля яго Ахазію, найменшага сына ягонага,
бо ўсіх старэйшых забіла дружына, якая прыходзіла з Арабамі на табар [Егарама]. І пачаў
валадарыць Ахазія, сын Егарама, валадара Юды.
2 Дваццаць два гады было Ахазіі, калі ён заваладарыў, і адзін год ён валадарыў у Ерусаліме. А
імя маці ягонае — Аталія, дачка Омры.
3 Ён таксама хадзіў шляхамі дому Ахава, бо маці ягоная была дарадніцай ягонай у нягоднасьці.
4 І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА, як дом Ахава, бо яны былі дарадцамі ягонымі пасьля
сьмерці бацькі ягонага на загубу яму.
5 Таксама паводле рады іхняй ён выйшаў і пайшоў з Ярамам, сынам Ахава, валадаром Ізраілю,
на вайну з Хазаэлем, валадаром Сірыі, у Рамот Гілеадзкі. І паранілі Сірыйцы Ярама,
6 і вярнуўся ён у Ізраіль лячыцца ад ранаў, якія ён атрымаў у Раме, калі ваяваў з Хазаэлем,
валадаром Сірыі. І Ахазія, сын Егарама, валадар Юды, прыйшоў убачыць Ярама, сына Ахава, у
Ізраіль, бо той быў хворы.
7 І ад Бога было на загубу Ахазіі, што ён прыйшоў да Ярама. І, прыйшоўшы, ён выйшаў з Ярамам
супраць Егу, сына Німшы, якога памазаў ГОСПАД на выгубленьне дому Ахава.
8 І сталася, калі Егу чыніў суд над домам Ахава, ён знайшоў князёў Юды і сыноў братоў Ахазіі,
якія служылі Ахазіі, і забіў іх.
9 І ён шукаў Ахазію, і схапілі яго, калі ён хаваўся ў Самарыі, і прывялі яго да Егу, і забілі яго, і
пахавалі яго, бо казалі: «Ён — сын Язафата, які шукаў ГОСПАДА ўсім сэрцам сваім». І не было
[нікога] ў доме Ахазіі, хто меў бы сілу валадарыць.
10 І Аталія, маці Ахазіі, убачыўшы, што памёр сын ейны, устала і выгубіла ўсё насеньне
валадарскае ў доме Юды.
11 Але Егашават, дачка валадара, узяла Ёаша, сына Ахазіі, і выкрала яго спасярод забіваных
сыноў валадарскіх, і завяла ў пакой спальны яго і карміцельку ягоную; і Егашават, дачка
валадара Егарама, жонка Егаяды сьвятара, якая была сястрой Ахазіі, схавала [Ёаша] перад
абліччам Аталіі, і тая не забіла яго.
12 І быў ён у іх у Доме Божым хаваны шэсьць гадоў, а Аталія валадарыла ў зямлі [Юды].

2 Лет 23

1 А ў сёмы год умацаваўся Егаяда, і заключыў запавет з начальнікамі сотняў: Азарыяй,
сынам Ерахама, Ізмаэлем, сынам Егаханана, Азарыяй, сынам Адэда, Маасэем, сынам Адая,
Элішафатам, сынам Зіхры.
2 І яны абыйшлі Юду, і сабралі лявітаў з усіх гарадоў Юды і галоваў [дамоў] бацькоў Ізраіля, і
прыйшлі ў Ерусалім.
3 І ўся царква заключыла запавет з валадаром у Доме ГОСПАДА. І [Егаяда] сказаў ім: «Вось,
сын валадара мае валадарыць, як ГОСПАД сказаў пра сыноў Давіда.
4 Гэтую рэч маеце рабіць: траціна з вас, якія прыходзяць у суботу, са сьвятароў і лявітаў,
[будзе] прыдзьвернікамі пры парогах [Дому Божага],
5 і траціна — у доме валадара, і траціна — пры браме Есод, а ўвесь народ [будзе] на панадворках
Дому ГОСПАДА.
6 І ніхто няхай не ўваходзіць у Дом ГОСПАДА, акрамя сьвятароў і лявітаў, якія служаць. Яны
маюць увайсьці, бо яны — пасьвячоныя, а ўвесь народ няхай захоўвае загады ГОСПАДА.

7 І няхай лявіты аточаць валадара вакол, кожны са зброяй сваёй у руцэ сваёй, і хто будзе
ўваходзіць у Дом, няхай будзе забіты. І будзьце пры валадары, калі ён будзе ўваходзіць і
выходзіць».
8 І зрабілі лявіты і ўвесь Юда паводле ўсяго, што загадаў Егаяда сьвятар, і ўзялі кожны людзей
сваіх, якія прыходзяць у суботу і якія адыходзяць у суботу, бо не адпусьціў Егаяда сьвятар
чэргаў [лявітаў].
9 І раздаў Егаяда сьвятар начальнікам сотняў дзіды, тарчы і шчыты, якія [зрабіў] валадар Давід
і якія [былі] ў Доме Божым,
10 і паставіў увесь народ, і кожны меў зброю сваю ў руцэ сваёй, ад правага боку Дому аж да
левага боку Дому, перад ахвярнікамі і каля Дому навокал валадара.
11 І вывялі сына валадара, і ўлажылі на яго карону, і [далі яму Каўчэг] Сьведчаньня, і паставілі
яго валадаром; і Егаяда і сыны ягоныя памазалі яго, і сказалі: «Няхай жыве валадар!»
12 І пачула Аталія голас народу, які бегаў і славіў валадара, і выйшла да народу ў Дом ГОСПАДА.
13 І ўбачыла яна, і вось, валадар стаіць на ўзвышэньні каля ўваходу, і начальнікі, і трубы
пры валадары, і ўвесь народ зямлі радуецца, і трубіць у трубы, і сьпевакі з музычнымі
інструмэнтамі кіруюць хвалою. І разьдзерла Аталія шаты свае, і закрычала: «Змова! Змова!»
14 І вывеў Егаяда сьвятар начальнікаў сотняў, якія былі пастаўленыя над войскам, і сказаў ім:
«Выведзіце яе з шэрагаў, а хто пойдзе за ёю, няхай будзе забіты мячом». Бо сьвятар сказаў:
«Не забівайце яе ў Доме ГОСПАДА».
15 І налажылі рукі на яе, і выйшла яна да ўваходу брамы конскай дому валадара, і там забілі
яе.
16 І Егаяда заключыў запавет паміж сабою і паміж усім народам і валадаром, каб яны былі
народам ГОСПАДА.
17 І ўвесь народ пайшоў да дому Баала, і зруйнаваў яго, і ахвярнікі ягоныя, і выявы ягоныя
разьбілі, і забілі Маттана, сьвятара Баала, перад ахвярнікамі.
18 І Егаяда перадаў урады ў Доме ГОСПАДА ў рукі сьвятароў і лявітаў, якіх Давід прызначыў у
Доме ГОСПАДА ахвяраваць цэласпаленьні ГОСПАДУ, як напісана ў Законе Майсея, з радасьцю
і сьпяваньнем, паводле пастановы Давіда.
19 І паставіў ён прыдзьвернікаў каля брамаў Дому ГОСПАДА, каб не ўваходзіў ніхто нячысты.
20 І ўзяў ён начальнікаў сотняў, магнатаў, і кіраўнікоў народу, і ўвесь народ зямлі, і вывялі
валадара з Дому ГОСПАДА, і прайшлі праз браму найвышэйшую ў дом валадара, і пасадзілі
валадара на пасадзе валадарскім.
21 І радаваўся ўвесь народ зямлі, і горад быў у супакоі. А Аталію забілі мячом.

2 Лет 24

1 Сем гадоў было Ёашу, калі ён пачаў валадарыць, і сорак гадоў ён валадарыў у Ерусаліме. Імя
маці ягонай — Цыбэя з Бээр-Шэвы.
2 І рабіў Ёаш слушнае ў вачах ГОСПАДА ўсе дні Егаяды сьвятара.
3 І ўзяў [Егаяда] для яго дзьве жонкі, і ён меў сыноў і дочак.
4 І сталася пасьля гэтага, было ў сэрцы Ёаша аднавіць Дом ГОСПАДА.
5 І сабраў ён сьвятароў і лявітаў, і сказаў ім: «Ідзіце ў гарады Юды, і зьбірайце з усяго Ізраіля
срэбра на направу Дому Бога вашага год у год, і пасьпяшайцеся ў справе гэтай». Але не
сьпяшаліся лявіты.
6 І паклікаў валадар Егаяду, галаву [сьвятароў], і сказаў яму: «Чаму ты не вымагаў ад лявітаў,
каб яны прыносілі з Юды і з Ерусаліму дары, [як загадаў] Майсей, слуга ГОСПАДА, і царква
Ізраіля для Намёту Сьведчаньня?»
7 Бо сыны Аталіі, гэтай бязбожніцы, уварваліся ў Дом ГОСПАДА і ўсе пасьвячоныя рэчы Дому
ГОСПАДА аддалі Баалам.
8 І сказаў валадар, і зрабілі адну скрыню, і паставілі яе ў браме Дому ГОСПАДА звонку.
9 І абвясьцілі ў Юдзе і ў Ерусаліме, каб прыносілі ГОСПАДУ дары, [як загадаў] Майсей, слуга
Божы, Ізраілю ў пустыні.
10 І радаваліся ўсе князі і ўвесь народ, і прыносілі, і кідалі ў скрыню, аж пакуль напоўнілі.

11 І было ў той час, што прыносілі скрыню рукамі лявітаў да ўраду валадарскага, і калі бачылі,
што шмат срэбра, тады прыходзіў пісар валадарскі і прадстаўнік сьвятара найвышэйшага, і
высыпалі са скрыні, і бралі яе, і адносілі яе зноў на месца сваё. Гэтак яны рабілі дзень пры дні,
і сабралі шмат срэбра.
12 І давалі яго валадар і Егаяда тым, якія рабілі працу абслугоўваньня Дому ГОСПАДА, і наймалі
каменяроў і цесьляроў, каб аднаўляць Дом ГОСПАДА, а таксама майстроў жалеза і медзі, каб
мацаваць Дом ГОСПАДА.
13 І рабілі працаўнікі, і хутка ішла праца ў руках іхніх, і паставілі Дом ГОСПАДА на месцы
ягоным, і ўмацавалі яго.
14 І калі скончылі, прынесьлі рэшту срэбра перад аблічча валадара і Егаяды, і зрабілі начыньне
для Дому ГОСПАДА, начыньне для служэньня і цэласпаленьня, і келіхі, і начыньне залатое і
срэбнае. І прыносілі цэласпаленьні ў Доме ГОСПАДА заўсёды ў-ва ўсе дні Егаяды.
15 І пастарэў Егаяда, і быў насычаны днямі, і памёр. Ён меў сто трыццаць гадоў, калі памёр.
16 І пахавалі яго ў горадзе Давіда з валадарамі, бо ён рабіў добрае ў Ізраілі для Бога і для Дому
Ягонага.
17 А пасьля сьмерці Егаяды прыйшлі князі Юды, і пакланіліся валадару; тады валадар пачаў
слухаць іх.
18 І пакінулі яны Дом ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, і служылі Астартам і ідалам, і прыйшоў
гнеў [Божы] на Юду і на Ерусалім за гэтую правіну іхнюю.
19 І Ён пасылаў да іх прарокаў, каб навярнуць іх да ГОСПАДА, і яны сьведчылі супраць іх, але
яны не зважалі.
20 І Дух Божы ахінуў Захарыю, сына Егаяды сьвятара, і ён стаў перад народам, і сказаў ім:
«Гэта кажа Бог: “Чаму вы парушаеце прыказаньні ГОСПАДА? Ня будзеце мець посьпеху, бо вы
пакінулі ГОСПАДА, і Ён пакінуў вас”».
21 І яны змовіліся супраць яго, і закідалі камянямі паводле загаду валадара на панадворку
Дому ГОСПАДА.
22 І не ўзгадаў валадар Ёаш міласэрнасьць, якую Егаяда, бацька ягоны, зрабіў яму, і забіў сына
ягонага. І, паміраючы, той сказаў: «Няхай убачыць ГОСПАД і адпомсьціць».
23 І сталася напрыканцы году, выйшла супраць яго войска Сірыйскае, і прыйшлі ў Юду і
Ерусалім, і выбілі ўсіх князёў народу спаміж народу, і ўсю здабычу сваю паслалі валадару
Дамаску.
24 Хоць войска Сірыйскае прыйшло ў малой колькасьці, але ГОСПАД даў сілу вельмі вялікую ў
рукі іхнія, бо [Юда] пакінуў ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, і яны ўчынілі суды над Ёашам.
25 І калі адыйшлі ад яго, пакінуўшы яго ў шматлікіх хваробах, слугі ягоныя змовіліся супраць
яго за кроў сыноў Егаяды сьвятара, і забілі яго на ложку ягоным, і ён памёр. І пахавалі яго ў
горадзе Давіда, але не пахавалі яго ў магіле валадарскай.
26 А гэта тыя, якія змовіліся супраць яго: Завад, сын Шымэаты Аманянкі, і Егазавад, сын
Шымрыт Мааўлянкі.
27 А пра сыноў ягоных, і пра мноства цяжараў, [накладзеных] на яго, і пра направу Дому
Божага, вось, гэта запісана ў гісторыі Кнігі валадароў. І пачаў валадарыць Амазія, сын ягоны,
пасьля яго.

2 Лет 25

1 Дваццаць пяць гадоў было Амазіі, калі ён пачаў валадарыць, і дваццаць дзевяць гадоў ён
валадарыў у Ерусаліме. Імя маці ягонай — Егааддан з Ерусаліму.
2 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, але ня шчырым сэрцам.
3 І сталася, калі ўмацавалася за ім валадарства, ён пазабіваў слугаў сваіх, якія забілі валадара,
бацьку ягонага.
4 Але сыноў іхніх не пазабіваў, бо напісана ў Законе, у кнізе Майсея, якому загадаў ГОСПАД,
кажучы: «Не памруць бацькі за сыноў, і сыны не памруць за бацькоў, але кожны за грэх свой
мае памерці».
5 І сабраў Амазія Юду, і паставіў іх паводле дамоў бацькоў, паводле начальнікаў над тысячамі і
паводле начальнікаў над сотнямі ў-ва ўсім Юдзе і Бэн’яміне; і палічыў іх ад веку дваццаці гадоў

і вышэй, і знайшоў іх трыста тысячаў чалавек выбраных, якія выходзяць на вайну і трымаюць
дзіду і шчыт.
6 І наняў ён у Ізраілі сто тысячаў ваяроў мужных за сто талентаў срэбра.
7 І чалавек Божы прыйшоў да яго, кажучы: «Валадару, няхай не ідзе з табою войска Ізраіля, бо
няма ГОСПАДА з Ізраілем, з усімі сынамі Эфраіма.
8 Але ты ідзі, рабі, будзь мужны ў бітве, бо можа зрабіць Бог, што ты спатыкнешся перад
абліччам ворага, бо ёсьць моц у Бога, каб дапамагчы і каб прывесьці да спатыкненьня».
9 І сказаў Амазія чалавеку Божаму: «А што рабіць з сотняй талентаў, якія я аддаў дружынам
Ізраіля?» І сказаў чалавек Божы: «ГОСПАД можа даць табе больш за гэта».
10 І аддзяліў Амазія тыя дружыны, якія прыйшлі да яго з Эфраіма, каб яны ішлі на месца сваё.
І вельмі ўзгарэўся гнеў іхні на Юду, і яны вярнуліся на месца сваё, палаючы гневам.
11 А Амазія ўмацаваўся, і павёў народ свой, і пайшоў у даліну Салёную, і пабіў сыноў Сэіру
дзесяць тысячаў.
12 І дзесяць тысячаў жывых узялі ў палон сыны Юды; і прывялі іх на вяршыню скалы, і скінулі
іх з вяршыні скалы, і ўсе яны разьбіліся.
13 А людзі з дружынаў, якіх Амазія вярнуў, каб яны не ішлі з ім на вайну, рассыпаліся па
гарадах Юды, ад Самарыі аж да Бэт-Харону; і забілі там тры тысячы [чалавек], і нарабавалі
здабычу вялікую.
14 І сталася, калі Амазія вярнуўся, пабіўшы Эдомцаў, ён прынёс багоў сыноў Сэіру, і паставіў
іх у сябе як багоў, і перад імі пакланіўся, і для іх кадзіў.
15 І ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА на Амазію, і Ён паслаў да яго прарока, і той сказаў яму: «Дзеля
чаго ты шукаеш багоў народу, якія ня выбавілі народу свайго ад рукі тваёй?»
16 І сталася, калі ён прамаўляў, [валадар] сказаў: «Ці я паставіў цябе дарадцам валадара?
Перастань, навошта я маю забіць цябе?» І перастаў прарок, і сказаў: «Я ведаю, што Бог
пастанавіў загубіць цябе, бо ты зрабіў гэта і не паслухаў рады маёй».
17 І радзіўся Амазія, валадар Юды, і паслаў да Ёаша, сына Егаахаза, сына Егу, валадара Ізраіля,
кажучы: «Выходзь, паглядзім абліччы [адзін аднаго]».
18 І паслаў Ёаш, валадар Ізраілю, да Амазіі, валадара Юды, кажучы: «Цёрн, які на Лібане, паслаў
да кедра, які на Лібане, кажучы: “Аддай дачку тваю за жонку сыну майму”. Але праходзіў
зьвер палявы, які на Лібане, і патаптаў цёрн гэты.
19 Ты сказаў: “Вось, я пабіў Эдом”, і ўзьнялося сэрца тваё, каб ганарыцца. Цяпер сядзі ў доме
тваім. Навошта табе выклікаць ліха, бо ўпадзеш ты, і Юда з табою».
20 І не паслухаў Амазія, бо ад Бога [было] гэта, каб аддаць іх у рукі [Ёаша] за тое, што яны
шукалі багоў Эдому.
21 І выйшаў Ёаш, валадар Ізраіля, і яны ўбачылі абліччы [адзін аднаго], ён і Амазія, валадар
Юды, у Бэт-Шэмэшы, які ў Юдзе.
22 І быў пабіты Юда перад абліччам Ізраіля, і ўцяклі кожны ў намёт свой.
23 І Амазію, валадара Юды, сына Ёаша, сына Егаахаза, схапіў Ёаш, валадар Ізраіля, у Бэт-
Шэмэшы, і прывёў яго ў Ерусалім, і зрабіў вылом у муры Ерусаліму ад брамы Эфраіму аж да
брамы Вуглавой на чатырыста локцяў.
24 І ўзяў ён усё золата і срэбра, і ўсе начыньні, якія былі ў Доме Божым у Абэд-Эдома, і скарбы
дому валадара, і закладнікаў, і вярнуўся ў Самарыю.
25 І жыў Амазія, сын Ёаша, валадар Юды, пасьля сьмерці Ёаша, сына Егаахаза, валадара Ізраіля,
пятнаццаць гадоў.
26 А іншыя справы Амазіі, першыя і апошнія, запісаныя ў Кнізе валадароў Юды і Ізраіля.
27 І пасьля таго часу, калі Амазія адыйшоў ад ГОСПАДА, зрабілі супраць яго змову ў Ерусаліме,
і ён уцёк у Ляхіш. І паслалі за ім у Ляхіш, і забілі яго там.
28 І прывезьлі яго коньмі, і пахавалі яго з бацькамі ягонымі ў горадзе Юды.

2 Лет 26

1 І ўзяў увесь народ Юды Узію, а ён [меў] шаснаццаць гадоў, і паставілі яго за валадара пасьля

Амазіі, бацькі ягонага.
2 Ён пабудаваў Элят і вярнуў яго Юдзе, калі супачыў валадар з бацькамі сваімі.
3 Шаснаццаць гадоў [меў] Узія, калі пачаў валадарыць, і пяцьдзясят два гады валадарыў у
Ерусаліме. А імя маці ягонай — Ехолія з Ерусаліму.
4 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, усё так, як рабіў Амазія, бацька ягоны.
5 І шукаў ён Бога ў дні Захарыі, які разумеў відзежы Божыя; і ў тыя дні, калі ён шукаў ГОСПАДА,
Бог даваў яму посьпех.
6 І ён выйшаў, і ваяваў з Філістынцамі; і разбурыў муры Гату, муры Яўнэі, і муры Ашдоду; і
пабудаваў гарады ў Ашдодзе і ў Філістынцаў.
7 І дапамагаў яму Бог супраць Філістынцаў і супраць Арабаў, якія жылі ў Гур-Баале, і супраць
Мэунянаў.
8 І Аманяне давалі дары Узіі. І разыйшлася [вестка пра] імя ягонае аж да ўваходу ў Эгіпет, бо
ўзмацніўся ён незвычайна.
9 І пабудаваў Узія вежы ў Ерусаліме пры Браме Вуглавой, пры Браме Даліны і на рагу, і
ўмацаваў іх.
10 І пабудаваў ён вежы ў пустыні, і выкапаў шмат сажалак, бо ў яго было шмат статкаў, і ў
Шэфэлі, і на раўніне, і [меў ён] земляробаў, і вінаградараў у гарах і на Кармэлю, бо ён быў
аматарам земляробства.
11 І было ў Узіі войска, якое выходзіла на вайну дружынамі, паводле ліку попісу іхняга,
[зробленага] рукою Еіэля пісара і Маасэі наглядчыка, пад рукою Хананіі, [аднаго] з князёў
валадара.
12 Увесь лік галоваў [дамоў] бацькоў, ваяроў мужных — дзьве тысячы шэсьцьсот.
13 І пад рукою іхняю здатных да войска — трыста сем тысячаў пяцьсот тых, якія ідуць на вайну
з вайсковай мужнасьцю, на дапамогу валадару супраць ворага.
14 І прыгатаваў для іх Узія, для ўсяго войска, шчыты, дзіды, шаломы, панцыры, лукі і камяні
для пушчалак.
15 І зрабіў ён у Ерусаліме махіны вайсковыя, вынаходліва прадуманыя, каб яны былі на вежах
і на кутах дзеля страляньня стрэламі і камянямі вялікімі. І разыйшлося імя ягонае далёка, бо
ён меў [праз гэта] цудоўную дапамогу і стаўся моцным.
16 Але калі ён узмацніўся, заганарылася сэрца ягонае аж да загубы, і ён стаў няверным ГОС-
ПАДУ, Богу свайму, і ўвайшоў ён у сьвятыню ГОСПАДА, каб кадзіць на ахвярніку каджэньня.
17 І ўвайшоў за ім Азарыя сьвятар, і з ім восемдзясят сьвятароў ГОСПАДА, людзей мужных.
18 І супрацівіліся яны Узіі валадару, і сказалі яму: «Не табе, Узія, кадзіць ГОСПАДУ, бо гэта для
сьвятароў, сыноў Аарона, якія пасьвячоныя для каджэньня. Выйдзі са сьвятыні, бо ты стаў
няверным, і ня будзе табе славы ў ГОСПАДА Бога».
19 І загневаўся Узія, а ў руцэ ягонай [была] кадзільніца для каджэньня. І калі загневаўся ён
на сьвятароў, праказа закрасавала на чале ягоным перад абліччам сьвятароў у Доме ГОСПАДА
каля ахвярніка каджэньня.
20 І павярнуўся да яго Азарыя, сьвятар найвышэйшы, і ўсе сьвятары, і вось, праказа на чале
ягоным. І яны выпхнулі яго адтуль, і ён сам пасьпяшаўся выйсьці, бо наведаў яго ГОСПАД.
21 І быў валадар Узія пракажоны аж да дня сьмерці сваёй, і жыў у асобным доме, як пракажоны,
бо адлучаны быў ад Дому ГОСПАДА. І Ётам, сын ягоны, быў над домам валадарскім, судзячы
народ зямлі.
22 А іншыя дзеяньні Узіі, першыя і апошнія, запісаў Ісая, сын Амоса, прарок.
23 І супачыў Узія з бацькамі сваімі, і пахавалі яго з бацькамі ягонымі на полі магілаў
валадарскіх, бо казалі: “Ён пракажоны”. І пачаў валадарыць Ётам, сын ягоны, пасьля яго.

2 Лет 27

1 Дваццаць пяць гадоў [было] Ётаму, калі ён пачаў валадарыць, і шаснаццаць гадоў ён
валадарыў у Ерусаліме. Імя маці ягонай — Еруша, дачка Цадока.

2 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, усё так, як рабіў Узія, бацька ягоны, толькі ён не
ўваходзіў у сьвятыню ГОСПАДА, а народ яшчэ ліхадзейнічаў.
3 Ён пабудаваў верхнюю браму Дому ГОСПАДА, і шмат пабудаваў на муры Афэла.
4 І ён пабудаваў гарады на гары Юды, і ў лясах паставіў крэпасьці і вежы.
5 І ён ваяваў з валадаром сыноў Амона, і перамог іх; і далі яму сыны Амона ў той год сто
талентаў срэбра, і дзесяць тысячаў кораў пшаніцы, і ячменю дзесяць тысячаў [кораў]. Гэта
давалі ізноў яму сыны Амона і на другі год, і на трэці.
6 І стаў моцным Ётам, бо ён падрыхтаваў шляхі свае перад абліччам ГОСПАДА, Бога свайго.
7 А іншыя дзеяньні Ётама, і ўсе войны ягоныя, і шляхі ягоныя запісаныя ў Кнізе валадароў
Ізраіля і Юды.
8 Дваццаць пяць гадоў [было] яму, калі пачаў валадарыць, і шаснаццаць гадоў валадарыў у
Ерусаліме.
9 І супачыў Ётам з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў горадзе Давіда. І пачаў валадарыць Ахаз,
сын ягоны, пасьля яго.

2 Лет 28

1 Дваццаць гадоў [было] Ахазу, калі ён пачаў валадарыць, і шаснаццаць гадоў ён валадарыў у
Ерусаліме; і не рабіў ён таго, што слушнае ў вачах ГОСПАДА, як Давід, бацька ягоны.
2 І хадзіў ён шляхамі валадароў Ізраілю, і нават зрабіў літыя балваны Баалаў.
3 І ён кадзіў у даліне Бэн-Гінном, і спаліў сыноў сваіх у агні паводле брыдотаў тых народаў,
якіх выгнаў ГОСПАД перад абліччам сыноў Ізраіля.
4 І ён складаў ахвяры, і кадзіў на ўзвышшах і на ўзгорках, і пад кожным дрэвам зялёным.
5 І аддаў яго ГОСПАД, Бог ягоны, у рукі валадара Сірыі, і яны пабілі яго, і ўзялі ў яго ў палон
шмат палонных, і завялі ў Дамаск. І таксама ў руку валадара Ізраіля ён быў аддадзены, і той
ударыў яго паразай вялікаю.
6 І забіў Пэках, сын Рэмаліі, у Юдзе сто дваццаць тысячаў за адзін дзень, а ўсе яны — людзі
мужныя, бо яны пакінулі ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх.
7 І забіў ён Зіхры, волата з Эфраіму, Маасэю, сына валадара, Азрыкама, кіраўніка дому, і
Элькану, другога пасьля валадара.
8 І ўзялі сыны Ізраіля ў палон у братоў сваіх дзьвесьце тысячаў жанчынаў, сыноў і дачок; і
таксама шмат здабычы нарабавалі ў іх, і завезьлі здабычу ў Самарыю.
9 І там быў прарок ГОСПАДА, імя ягонае — Адэд. І выйшаў ён перад аблічча войска, якое
ўваходзіла ў Самарыю, і сказаў ім: «Вось, ГОСПАД, Бог бацькоў вашых, у гневе на Юду аддаў іх
у руку вашую, і вы забілі іх з лютасьцю, якая дайшла да неба.
10 І цяпер вы думаеце мець сыноў Юды і Ерусаліму як слугаў і нявольнікаў. А ці самі вы ня
маеце правіны перад ГОСПАДАМ, Богам вашым?
11 І цяпер паслухайце мяне, і вярніце палонных, якіх вы ўзялі ў палон з братоў вашых; бо
полымя гневу ГОСПАДА [прыйдзе] на вас».
12 І ўсталі некаторыя з галоваў сыноў Эфраіма: Азарыя, сын Егаханана, Бэрэхія, сын
Мэшылемота, Эхізкія, сын Шальлюма, і Амаса, сын Хадлая, насупраць тых, што вярталіся з
вайны,
13 і сказалі ім: «Ня ўводзьце сюды палонных, бо гэта будзе нам правіна перад ГОСПАДАМ, якую
вы думаеце дадаць да грахоў нашых і да правінаў нашых. Бо вялікая правіна наша, і полымя
гневу [Божага] над Ізраілем».
14 І ўзброеныя пакінулі палонных і здабычу перад абліччам князёў і ўсёй царквы [Ізраіля].
15 І ўсталі мужы, якіх вызначылі па імёнах, і ўзялі палонных, і ўсіх голых з іх апранулі са
здабычы, і апранулі іх, і абулі, і далі ім есьці, і далі ім піць, і памазалі [раны] іх, і пасадзілі на
аслоў усіх кволых, і завялі іх у Ерыхон, горад пальмаў, да братоў іхніх, і вярнуліся ў Самарыю.
16 У той час паслаў валадар Ахаз да валадароў Асірыі, каб яны дапамаглі яму.
17 І зноў прыйшлі Эдомцы, і пабілі [шмат] у Юдзе, і ўзялі ў палон.
18 А Філістынцы напалі на гарады Шэфэлі і Нэгеву Юдэйскага, і ўзялі Бэт-Шэмэш, Аялон і
Гедэрот, Сахо і вёскі ейныя, Тымну і вёскі ейныя, Гімзо і вёскі ягоныя, і пасяліліся там,

19 бо прынізіў ГОСПАД Юду з прычыны Ахаза, валадара Ізраіля, бо ён разкелзаў Юду і
нявернасьцю стаў няверным ГОСПАДУ.
20 І прыйшоў да яго Тыглят-Пільнэсэр, валадар Асірыі, і прыціснуў яго, а не ўмацаваў яго,
21 бо Ахаз узяў частку [маёмасьці] Дому ГОСПАДА і дому валадарскага і князёў, і аддаў
валадару Асірыі, але не [прынесла гэта] дапамогі яму.
22 І ў часе ўціску свайго валадар Ахаз павялічваў нявернасьць ГОСПАДУ,
23 і складаў ахвяры багам Дамаску, якія пабілі яго, і казаў: «Богі валадароў Сірыі дапамагаюць
ім, і я буду складаць ахвяры ім, і яны дапамогуць мне». Але яны былі на спатыкненьне яму і
ўсяму Ізраілю.
24 І сабраў Ахаз начыньні Дому Божага, і пасек начыньні Дому Божага, і замкнуў дзьверы Дому
ГОСПАДА, і зрабіў сабе ахвярнікі ў-ва ўсіх кутах Ерусаліму,
25 і ў-ва ўсіх гарадах Юды зрабіў узвышшы, каб кадзіць іншым багам, і гнявіў ГОСПАДА, Бога
бацькоў сваіх.
26 А іншыя дзеяньні ягоныя і ўсе ўчынкі ягоныя, першыя і апошнія, вось, яны запісаныя ў Кнізе
валадароў Юды і Ізраілю.
27 І супачыў Ахаз з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў горадзе, у Ерусаліме; але ня ўнесьлі яго ў
магілы валадароў Ізраіля. І пачаў валадарыць Эзэкія, сын ягоны, пасьля яго.

2 Лет 29

1 Эзэкія пачаў валадарыць, [маючы] дваццаць пяць гадоў, і дваццаць дзевяць гадоў валадарыў
у Ерусаліме. А імя маці ягонай — Абія, дачка Захарыі.
2 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, усё так, як рабіў Давід, бацька ягоны.
3 Ён у першы год валадараньня свайго, у першы месяц адчыніў дзьверы Дому ГОСПАДА і
ўмацаваў іх;
4 і прывёў сьвятароў і лявітаў, і сабраў іх на ўсходняй плошчы,
5 і сказаў ім: «Паслухайце мяне, лявіты! Цяпер асьвяціцеся [самі] і асьвяціце Дом ГОСПАДА,
Бога бацькоў вашых, і выкіньце нячыстае са сьвятыні.
6 Бо бацькі нашыя былі няверныя, і рабілі ліха ў вачах ГОСПАДА, Бога нашага, і пакінулі Яго, і
адвярнулі аблічча свае ад Сялібы ГОСПАДА, і павярнуліся каркам;
7 таксама замкнулі дзьверы прысенка, і згасілі лямпы, і не кадзілі каджэньняў, і не складалі
цэласпаленьняў у сьвятыні для Бога Ізраіля.
8 І быў гнеў ГОСПАДА на Юдзе і Ерусаліме, і ён аддаў іх на ганьбаваньне, на спусташэньне і на
насьмешку, як вы бачыце вачыма вашымі.
9 І вось, пападалі бацькі нашыя ад мяча, а сыны нашыя, і дочкі нашыя, і жонкі нашыя ў палоне
за гэта.
10 Цяпер у сэрцы маім — заключыць запавет з ГОСПАДАМ, Богам Ізраіля, і Ён адверне ад нас
полымя гневу Свайго.
11 Сыны мае! Цяпер ня будзьце нядбайныя, бо вас выбраў ГОСПАД стаяць перад аблічча м
Ягоным, і быць Яму служыцелямі, і кадзіць Яму».
12 І ўсталі лявіты: Махат, сын Амасая, і Ёэль, сын Азарыі, з сыноў Кегата; і з сыноў Мэрары:
Кіш, сын Абадыі, і Азарыя, сын Егальлелеля; і з сыноў Гершона: Ёах, сын Зіммы, і Эдэн, сын
Ёаха,
13 і з сыноў Эліцафана: Шымты і Еіэль; і з сыноў Асафа: Захарыя і Маттанія;
14 і з сыноў Гэмана: Ехіэль і Шымэй; і з сыноў Едутуна: Шэмая і Узіэль.
15 І яны сабралі братоў сваіх, і асьвяціліся, і прыйшлі на загад валадара паводле слова
ГОСПАДА, каб ачысьціць Дом ГОСПАДА.
16 І ўвайшлі сьвятары ў сярэдзіну Дому ГОСПАДА, каб ачысьціць [яго], і вынесьлі ўсё нячыстае,
што знайшлі ў сьвятыні ГОСПАДА, на панадворак Дому ГОСПАДА; а лявіты ўзялі [гэта], каб
вынесьці навонкі да ручая Кедрон.

17 І яны пачалі асьвячэньне ў першы дзень першага месяца, і ў восьмы дзень месяца ўвайшлі
ў прысенак ГОСПАДА; і асьвячалі Дом ГОСПАДА восем дзён, і ў шаснаццаты дзень першага
месяца скончылі.
18 І ўвайшлі яны ў сярэдзіну [дому] да валадара Эзэкіі, і сказалі: «Мы ачысьцілі Дом ГОСПАДА,
і ахвярнік цэласпаленьня, і ўсё начыньне ягонае, і стол [хлябоў] пакладных, і ўсё начыньне
ягонае;
19 і ўсе начыньні, якія закінуў валадар Ахаз [у час] валадараньня свайго ў нявернасьці сваёй,
мы падрыхтавалі і асьвяцілі, і вось, яны перад ахвярнікам ГОСПАДА».
20 І ўстаў рана валадар Эзэкія, і сабраў князёў гораду, і ўвайшоў у Дом ГОСПАДА.
21 І прывялі сем бычкоў, і сем бараноў, і сем ягнятаў, і сем казлоў у ахвяру за грэх за
валадарства і за Сьвятыню і за Юду; і ён сказаў сынам Аарона сьвятара скласьці цэласпаленьне
на ахвярніку ГОСПАДА.
22 І зарэзалі валоў, і ўзялі сьвятары кроў, і пакрапілі ахвярнік; і зарэзалі бараноў, і пакрапілі
крывёй ахвярнік; і зарэзалі ягнятаў, і пакрапілі крывёй ахвярнік.
23 І прывялі казлоў у ахвяру за грэх перад аблічча валадара і царквы, і яны ўсклалі рукі свае
на іх.
24 І зарэзалі іх сьвятары, і ачысьцілі крывёю іхняй ахвярнік на перамольваньне за грахі ўсяго
Ізраіля; бо за ўвесь Ізраіль сказаў валадар [учыніць] цэласпаленьне і ахвяру за грэх.
25 І паставіў ён лявітаў у Доме ГОСПАДА з цымбаламі, псалтырамі і гусьлямі паводле загаду
Давіда і Гада, відушчага валадара, і Натана прарока, бо з рукі ГОСПАДА загад гэты [быў
паведамлены] праз рукі прарокаў Ягоных.
26 І сталі лявіты з музычнымі інструмэнтамі Давіда, і сьвятары — з трубамі.
27 І сказаў Эзэкія скласьці цэласпаленьні на ахвярніку. І ў час, калі пачалося цэласпаленьне,
пачаўся сьпеў ГОСПАДУ і [гук] трубаў і музычных інструмэнтаў Давіда, валадара Ізраіля.
28 І ўся царква пакланялася, і сьпевакі сьпявалі, і ў трубы, трубячы, трубілі, пакуль ня
скончылася цэласпаленьне.
29 І калі скончылі цэласпаленьне, укленчылі валадар і ўсе, што былі з ім, і пакланіліся.
30 І сказаў валадар Эзэкія і князі лявітам, каб яны хвалілі ГОСПАДА словамі Давіда і Асафа
відушчага, і яны хвалілі з радасьцю, і кленчылі, і пакланяліся.
31 І адказаў Эзэкія, і сказаў: «Цяпер вы напоўнілі рукі вашыя для ГОСПАДА. Падыйдзіце і
прынясіце ахвяры і [дары] падзякі ў Дом ГОСПАДА». І ахвяроўвала царква ахвяры і [дары]
падзякі, і ўсе, якія былі ахвотныя сэрцам, [прынесьлі] цэласпаленьні.
32 І быў лік цэласпаленьняў, якія прынесла царква: семдзясят валоў, сто бараноў, дзьвесьце
ягнятаў; усё гэта — на цэласпаленьне для ГОСПАДА.
33 І для пасьвячэньня [прынесьлі] шэсьцьсот валоў і тры тысячы авечак.
34 Толькі сьвятароў было мала, і яны не маглі абдзіраць скуру з усіх ахвяраў і цэласпаленьняў;
і дапамагалі ім браты іхнія, лявіты, пакуль праца не была скончана і пакуль іншыя сьвятары
не асьвяціліся; бо лявіты былі больш правыя сэрцам, каб асьвяціцца, чым сьвятары.
35 І таксама цэласпаленьняў было шмат з тлушчам ахвяраў мірных, і з ахвярамі вадкімі для
цэласпаленьня. Гэтак адноўлена было служэньне Дому ГОСПАДА.
36 І радаваўся Эзэкія і ўвесь народ з таго, што Бог падрыхтаваў народ, бо неспадзявана сталася
рэч гэтая.

2 Лет 30

1 І паслаў Эзэкія да ўсяго Ізраіля і Юды, і таксама напісаў лісты да Эфраіма і Манасы, каб яны
прыйшлі ў Дом ГОСПАДА ў Ерусалім спраўляць Пасху для ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
2 І радзіліся валадар, і князі ягоныя, і ўся царква ў Ерусаліме, каб спраўляць Пасху ў другі
месяц;
3 бо не маглі справіць яе ў час свой, бо сьвятароў не асьвяцілася дастаткова, і народ не сабраўся
ў Ерусаліме.
4 І была гэтая рэч слушнай у вачах валадара і ў вачах усёй царквы.

5 І яны пастанавілі абвясьціць слова ў-ва ўсім Ізраілі, ад Бээр-Шэвы аж да Дану, каб прыйшлі
ў Ерусалім спраўляць Пасху для ГОСПАДА, Бога Ізраіля, бо ня часта спраўлялі [яе так], як
напісана.
6 І пайшлі ганцы з лістамі ад валадара і князёў ягоных па ўсім Ізраілі і Юдзе паводле загаду
валадара, кажучы: «Сыны Ізраіля! Вярніцеся да ГОСПАДА, Бога Абрагама, Ісаака і Ізраіля, і Ён
павернецца, каб выратаваць тых, якія ў вас засталіся ад рукі валадароў Асірыі.
7 І ня будзьце, як бацькі вашыя і як браты вашыя, якія былі няверныя ГОСПАДУ, Богу бацькоў
сваіх; і Ён аддаў іх на спусташэньне, як вы бачыце.
8 Цяпер не рабіце цьвёрдымі каркі вашыя, як бацькі вашыя, дайце руку ГОСПАДУ, і прыходзьце
ў сьвятыню Ягоную, якую Ён асьвяціў на вякі; і служыце ГОСПАДУ, Богу вашаму, і Ён адверне
ад вас полымя гневу Свайго.
9 Бо калі вы вернецеся да ГОСПАДА, тады браты вашыя і дзеці вашыя [знойдуць] ласку перад
абліччам тых, якія забралі іх у палон, і вернуцца ў зямлю гэтую; бо літасьцівы і спагадлівы
ГОСПАД, Бог ваш, і Ён не адверне аблічча ад вас, калі вы навернецеся да Яго».
10 І праходзілі ганцы з горада ў горад па зямлі Эфраіма і Манасы і аж да Завулёна; і былі [тыя,
якія] сьмяяліся і зьдзекваліся з іх.
11 Толькі некаторыя з Асэра, Манасы і Завулёна ўпакорыліся і прыйшлі ў Ерусалім.
12 Таксама ў Юдзе была рука Божая, што дала ім адно сэрца, каб выканаць загад валадара і
князёў, паводле слова ГОСПАДА.
13 І сабралася ў Ерусаліме мноства народу спраўляць Сьвята Праснакоў у другі месяц, царква
вельмі шматлікая.
14 І ўсталі, і павалілі ахвярнікі, якія [былі] ў Ерусаліме, і ўсе [ахвярнікі] каджэньня павалілі і
кінулі ў ручай Кедрон.
15 І зарэзалі пасхальнае [ягня] ў чатырнаццаты дзень другога месяца. А сьвятары і лявіты
засароміліся, і асьвяціліся, і прынесьлі цэласпаленьні ў Доме ГОСПАДА,
16 і сталі на месцах сваіх паводле пастановаў іхніх, паводле Закону Майсея, чалавека Божага.
Сьвятары крапілі крывёй, [узяўшы] яе з рук лявітаў.
17 А як у царкве шмат было такіх, якія не асьвяціліся, лявіты рэзалі пасхальных [ягнятаў] за
кожнага нячыстага, каб асьвяціць [іх] для ГОСПАДА.
18 А таму, што мноства народу, шмат з Эфраіма і Манасы, Ісахара і Завулёна не была
ачысьціўшыся, і яны елі Пасху не паводле таго, што напісана, Эзэкія памаліўся за іх, кажучы:
«ГОСПАД добры няхай даруе кожнаму,
19 хто падрыхтаваў сэрца сваё шукаць Бога ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх, хоць не [зрабіў]
ачышчэньня сьвятога».
20 І пачуў ГОСПАД Эзэкію, і аздаравіў народ.
21 І сыны Ізраіля, якія былі ў Ерусаліме, спраўлялі Сьвята Праснакоў сем дзён з радасьцю
вялікай; і хвалілі ГОСПАДА дзень пры дні лявіты і сьвятары з усёй моцай для [славы] ГОСПАДА.
22 І прамовіў Эзэкія да сэрца ўсіх лявітаў, якія мелі добрае разуменьне ГОСПАДА. І елі ўвесь
час [сьвяточны] сем дзён, ахвяруючы ахвяры мірныя і славячы ГОСПАДА, Бога бацькоў сваіх.
23 І радзілася ўся царква, каб спраўляць [сьвята] наступныя сем дзён, і спраўлялі [сьвята] сем
дзён з радасьцю;
24 бо Эзэкія, валадар Юды, даў для царквы тысячу валоў і сем тысячаў авечак, а князі далі для
царквы тысячу валоў і дзесяць тысячаў авечак; і шмат сьвятароў асьвяціліся.
25 І радавалася ўся царква Юды, і сьвятары, і лявіты, і ўся царква, якая прыйшла з Ізраіля, і
прыхадні, якія выйшлі з зямлі Ізраіля і жылі ў Юдзе.
26 І была радасьць вялікая ў Ерусаліме, бо ад дзён Салямона, сына Давіда, валадара Ізраіля, не
было такога ў Ерусаліме.
27 І ўсталі сьвятары і лявіты, і дабраславілі народ, і быў пачуты голас іхні, і ўзыйшла малітва
іхняя да Сялібы Ягонай сьвятой у небе.

2 Лет 31

1 І калі ўсё гэта скончылася, выйшаў увесь Ізраіль, які знаходзіўся [там], у гарады Юды, і

пабілі слупы, і пасеклі астартаў, і разбурылі ўзвышшы і ахвярнікі ў-ва ўсім Юдзе і Бэн'яміне,
у Эфраіме і Манасе, аж да канца. І вярнуліся ўсе сыны Ізраіля кожны да ўласнасьці сваёй, у
горад свой.
2 І прызначыў Эзэкія чэргі сьвятароў і лявітаў паводле чэргаў іхніх, кожнага паводле
служэньня ягонага, сьвятароў і лявітаў для цэласпаленьняў і для ахвяраў мірных, каб
паслугавалі, славілі і хвалілі ў брамах табараў ГОСПАДА.
3 А частку валадара з маёмасьці ягонай [ён прызначыў] на цэласпаленьні, на цэласпаленьні
раніцаю і ўвечары, і на цэласпаленьні ў суботы і ў маладзікі, і на ўрачыстыя сьвяты, як напісана
ў Законе ГОСПАДА.
4 І сказаў народу, які жыў у Ерусаліме, каб давалі частку для сьвятароў і лявітаў, каб яны
ўмацаваліся ў Законе ГОСПАДА.
5 І калі пашырылася слова гэтае, прынесьлі сыны Ізраіля пяршыны збожжа, і віна, і алею, і
мёду, і ўсіх пладоў палявых; і прынесьлі яны шмат дзесяцінаў з усяго.
6 І сыны Ізраіля і Юды, якія жылі ў гарадах Юды, таксама прынесьлі дзесяціну валоў і авечак, і
дзесяціну рэчаў сьвятых, пасьвячоных ГОСПАДУ, Богу іхняму, і налажылі купы купаў.
7 У трэці месяц пачалі класьці гэтыя купы, а ў сёмым месяцы скончылі.
8 І прыйшлі Эзэкія і князі, і ўбачылі купы гэтыя, і дабраславілі ГОСПАДА і народ Ягоны, Ізраіля.
9 І пытаўся Эзэкія сьвятароў і лявітаў пра купы гэтыя.
10 І сказаў яму Азарыя, найвышэйшы сьвятар з дому Цадока, і сказаў: «Ад таго часу, калі пачалі
прыносіць дары ў Дом ГОСПАДА, мы елі і насыціліся, і засталося мноства, бо дабраславіў
ГОСПАД народ Свой; і тое, што засталося — гэтае мноства вялікае».
11 І сказаў Эзэкія, каб падрыхтавалі каморы ў Доме ГОСПАДА, і падрыхтавалі [іх].
12 І верна перанесьлі [туды] дары, і дзесяціны, і рэчы сьвятыя; і над імі загадчыкам быў Кананія
лявіт і Шымэй, брат ягоны, другім.
13 А Ехіэль, Азазія, Нахат, Асагэль, Ерымот, Ёзавад, Эліэль, Ісмахія, Махат і Бэная [былі]
наглядчыкамі пад рукою Кананіі і Шымэя, брата ягонага, паводле загаду валадара Эзэкіі і
Азарыі, начальніка над Домам Божым.
14 І Карэ, сын Імны, лявіт, прыдзьвернік з усходняга боку, [быў] над дарамі дабраахвотнымі
для Бога, каб выдаваць [братам] дары ГОСПАДАВЫ і сьвятое сьвятых.
15 І пад рукой ягонай [былі] Эдэн, Мін'ямін, Ешуа, Шэмая, Амарыя і Шэханія ў гарадах
сьвятарскіх, каб верна раздаваць [належнае] братам сваім паводле чаргі, як вялікаму, так і
малому,
16 акрамя сьпісу іхняга, мужчын ад трох гадоў і вышэй, усім, хто ўваходзіць у Дом ГОСПАДА, на
[выкананьне] слова дзень пры дні, на служэньне сваё паводле абавязкаў сваіх паводле чэргаў
сваіх,
17 і ўнесеным у сьпіс сьвятарам, паводле дому бацькоў іхніх, і лявітам ад дваццаці гадоў і
вышэй паводле абавязкаў іхніх і паводле чэргаў іхніх,
18 і ўнесеным у сьпіс з усімі дзецьмі іхнімі, жонкамі іхнімі, і сынамі іхнімі, і дочкамі іхнімі, з
усёй царквой — усёй грамадзе, бо яны верна пасьвяціліся на сьвятое [служэньне].
19 А для сыноў Аарона, сьвятароў, [якія мелі] палі на пашах гарадоў іхніх, у-ва ўсіх гарадах
[ён прызначыў] мужоў, якія названыя па імёнах, каб даваць часткі ўсім мужчынам сярод
сьвятароў і ўсім лявітам, унесеным у сьпіс.
20 І зрабіў гэтак Эзэкія ў-ва ўсім Юдзе, і рабіў ён тое, што добрае, слушнае і праўдзівае перад
абліччам ГОСПАДА, Бога свайго.
21 І ў-ва ўсёй працы, якую ён пачынаў, і ў служэнні Дому Божага, і ў [выкананьні] Закону і
прыказаньняў, каб шукаць Бога свайго, ён рабіў з усяго сэрца свайго, і меў посьпех.

2 Лет 32

1 Пасьля падзеяў гэтых і праўды гэтай, прыйшоў Сэнахерыў, валадар Асірыі, і ўвайшоў у Юду,
і паставіў [намёты] супраць гарадоў умацаваных, і гаварыў, што здабудзе іх для сябе.
2 І ўбачыў Эзэкія, што прыйшоў Сэнахерыў, і аблічча ягонае, каб ваяваць супраць Ерусаліму.

3 І радзіўся ён з князямі сваімі і з волатамі сваімі, каб спыніць ваду крыніцаў, якія звонку гораду; і яны дапамаглі яму.
4 І сабралася шмат народу, і яны спынілі ўсе крыніцы і ручай, які цячэ пасярод зямлі, кажучы:
«Навошта, прыйшоўшы, валадары Асірыі маюць знайсьці шмат вады?»
5 І ўмацаваўся [Эзэкія], і адбудаваў увесь разбураны мур, і падняў яго да вежаў, і другі мур
звонку, і ўмацаваў Міло ў горадзе Давіда, і зрабіў шмат зброі і шчытоў.
6 І паставіў начальнікаў вайсковых над народам, і сабраў іх да сябе на плошчы каля брамы
гораду, і прамовіў да сэрца іхняга, кажучы:
7 «Будзьце цвёрдыя і мужныя, ня бойцеся аблічча валадара Асірыі і аблічча
ўсяго мноства, якое з ім, бо [Той, Хто] з намі, большы, чым [тыя, хто] з ім.
8 З ім рамяно цялеснае, а з намі ГОСПАД, Бог наш, каб дапамагаць нам і ваяваць у войнах
нашых». І абаперся народ на словы Эзэкіі, валадара Юды.
9 Пасьля гэтага Сэнахерыў, валадар Асірыі, паслаў слугаў сваіх у Ерусалім, а сам ён быў пад
Ляхішам, і ўся сіла ягоная з ім, да Эзэкіі, валадара Юды, і да ўсяго Юды, які ў Ерусаліме,
кажучы:
10 «Гэта кажа Сэнахерыў, валадар Асірыі. На што вы спадзеяцёся і сядзіце ў аблозе ў Ерусаліме?
11 Няхай не падманвае вас Эзэкія, каб аддаць вас на сьмерць ад голаду і смагі, кажучы:
“ГОСПАД, Бог наш, выратуе нас ад рукі валадара Асірыі”.
12 Ці ня ён, Эзэкія, прыбраў узгоркі Ягоныя і ахвярнікі Ягоныя і сказаў Юдзе і Ерусаліму,
кажучы: “Перад адным ахвярнікам будзеце пакланяцца і на ім будзеце кадзіць”?
13 Ці ж вы ня ведаеце, што зрабіў я і бацькі мае ўсім народам земляў гэтых? Ці сапраўды маглі
богі народаў земляў гэтых выратаваць зямлю іхнюю ад рукі маёй?
14 Хто з усіх багоў народаў гэтых, якіх зрабілі закляцьцем бацькі мае, змог выратаваць народ
свой ад рукі маёй? Як жа зможа Бог ваш выратаваць вас ад рукі маёй?
15 І цяпер, няхай не падманвае вас Эзэкія і не ашуквае вас такім чынам, і ня верце яму, бо ня
мог ніводзін бог ніводнага народу і валадарства выратаваць народ свой ад рукі маёй і ад рукі
бацькоў маіх. Таксама Бог ваш ня выратуе вас ад рукі маёй».
16 І яшчэ прамаўлялі слугі ягоныя супраць ГОСПАДА Бога і супраць Эзэкіі, слугі Ягонага.
17 І лісты пісаў [Сэнахерыў], каб зьневажаць ГОСПАДА, Бога Ізраіля, і гаварыў суп- раць Яго,
кажучы: «Як богі народаў земляў гэтых ня выратавалі народаў сваіх ад рукі маёй, так Бог
Эзэкіі ня выратуе народ Свой ад рукі маёй».
18 І крычалі яны голасам вялікім па-юдэйску да народу Ерусаліму, які [быў] на мурах, каб
настрашыць яго, і напалохаць яго, і здабыць горад.
19 І гаварылі яны пра Бога Ерусаліму, як пра багоў народаў зямлі, выраб рук чалавечых.
20 І маліўся пра гэта валадар Эзэкія і Ісая, сын Амоса, і крычалі да неба.
21 І паслаў ГОСПАД анёла, і ён зьнішчыў мужных ваяроў, і правадыра, і табар валадара Асірыі.
І ён вярнуўся з сорамам аблічча ў зямлю сваю. І ён прыйшоў у дом бога свайго, і тыя, што
выйшлі з нутра ягонага, забілі там яго мячом.
22 І выратаваў ГОСПАД Эзэкію і жыхароў Ерусаліму ад рукі Сэнахерыва, валадара Асірыі, і ад
рукі ўсіх; і вёў іх паўсюль.
23 І шмат [людзей] прыносіла дары ГОСПАДУ ў Ерусалім і каштоўныя рэчы Эзэкіі, валадару
Юды. І ён пасьля гэтага ўзьвялічыўся ў вачах усіх народаў.
24 У тыя дні захварэў Эзэкія сьмяротна. І маліўся ён да ГОСПАДА; і Ён адказаў яму, і даў яму
знак.
25 Але не вярнуў Эзэкія [падзяку] паводле таго, што было зроблена яму, бо сэрца ягонае
ўзганарылася. І быў гнеў [Божы] на яго, і на Юду, і на Ерусалім.
26 І ўпакорыў Эзэкія ганарыстасьць сэрца свайго, ён і жыхары Ерусаліму, і не прыйшоў на іх
гнеў ГОСПАДА ў дні Эзэкіі.
27 І было ў Эзэкіі багацьця і славы вельмі шмат; і ён зрабіў сабе скарбніцу на срэбра і золата, і
на камяні каштоўныя, і на пахошчы, і на шчыты, і на ўсялякія рэчы каштоўныя,

28 і сьвірны на ўраджай збожжа, віна і алею, і хлявы для ўсякай скаціны, і загародкі для
чародаў.
29 І пабудаваў ён сабе гарады, і статкаў авечак і валоў [меў ён] мноства, бо даў яму Бог
маёмасьць вельмі вялікую.
30 І ён, Эзэкія, спыніў верхні выхад водаў Гіхону і правёў іх уніз да заходняга боку гораду
Давіда. І меў посьпех Эзэкія ў-ва ўсіх справах сваіх.
31 І толькі пры пасланцах князёў Бабілону, якіх яны паслалі да яго, каб даведацца пра цуд,
які адбыўся ў зямлі [ягонай], Бог пакінуў яго, каб выспрабаваць яго, каб даведацца ўсё, што ў
сэрцы ягоным.
32 А іншыя дзеяньні Эзэкіі, і дабрадзейства ягонае, вось, яны запісаныя ў відзежах Ісаі, сына
Амоса, прарока, у Кнізе валадароў Юды і Ізраілю.
33 І супачыў Эзэкія з бацькамі сваімі, і пахавалі яго вышэй магілаў сыноў Давіда, і ўшанавалі
яго пасьля сьмерці ягонай увесь Юда і жыхары Ерусаліму. І пачаў валадарыць Манаса, сын
ягоны, пасьля яго.

2 Лет 33

1 Дваццаць гадоў было Манасе, калі ён пачаў валадарыць, і пяцьдзясят гадоў ён валадарыў у
Ерусаліме.
2 І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА паводле ўсіх брыдотаў тых народаў, якіх выгнаў ГОСПАД
перад абліччам сыноў Ізраіля.
3 І ён ізноў пабудаваў узвышшы, якія панішчыў Эзэкія, бацька ягоны, і паставіў ахвярнікі
Баалам, і зрабіў Астартаў, і пакланяўся ўсяму войску нябеснаму, і служыў ім.
4 І пабудаваў ён ахвярнік у Доме ГОСПАДА, пра які сказаў ГОСПАД: «У Ерусаліме будзе імя Маё
на вякі»;
5 і пабудаваў ён ахвярнік усяму войску нябеснаму на абодвух панадворках Дому ГОСПАДА.
6 І ён праводзіў сыноў сваіх праз агонь у даліне Бэн-Гінном, і гадаў, і чараваў, і варажыў, і
паставіў тых, якія выклікаюць мёртвых, і тых, якія выклікаюць духаў, і павялічваў учынкі ліхія
ў вачах ГОСПАДА, каб гнявіць Яго.
7 І паставіў ён выяву ідала, якую зрабіў, у Доме Божым, пра які казаў Бог Давіду і Салямону,
сыну ягонаму: «У Доме гэтым і ў Ерусаліме, які Я абраў з усіх каленаў Ізраіля, Я палажу імя
Маё на вякі;
8 і не дазволю, каб выступіла нага Ізраіля з зямлі гэтай, якую Я прызначыў бацькам вашым, калі
толькі яны будуць захоўваць выкананьне ўсяго, што Я загадаў ім, увесь Закон, і пастановы, і
суды, [дадзеныя] рукой Майсея».
9 І зьвёў Манаса Юду і жыхароў Ерусаліму, каб рабілі горш за народы, якіх ГОСПАД выгубіў
перад абліччам сыноў Ізраіля!
10 І прамаўляў ГОСПАД да Манасы і народу ягонага, яле яны не зважалі.
11 І прывёў ГОСПАД на іх начальнікаў войска валадара Асірыі; і яны схапілі Манасу гакамі, і
закулі яго ў кайданы мядзяныя, і павялі яго ў Бабілон.
12 І калі ён быў уцісканы, ён умольваў аблічча ГОСПАДА, Бога свайго, і скарыўся вельмі перад
абліччам Бога бацькоў сваіх.
13 І маліўся ён да Яго, і Ён даўся ўпрасіць, і пачуў маленьне ягонае, і вярнуў яго ў Ерусалім на
валадарства ягонае. І даведаўся Манаса, што ГОСПАД, Ён [ёсьць] Бог.
14 І пасьля гэтага ён пабудаваў мур вонкавы ў горадзе Давіда, на заходнім баку Гіхону ў
даліне і пры ўваходзе ў браму Рыбную, і атачыў Афэл, і вельмі высока падняў яго. І паставіў
начальнікаў войска ў-ва ўсіх гарадах умацаваных Юды.
15 І выкінуў багоў чужых і выяву [ідала] з Дому ГОСПАДА, і ўсе ахвярнікі, якія пабудаваў на
версе Дому ГОСПАДА і ў Ерусаліме, выкінуў іх навонкі, за горад.
16 І пабудаваў ён ахвярнік ГОСПАДА, і ахвяраваў на ім ахвяры мірныя і ўдзячныя, і сказаў да
Юды, каб яны служылі ГОСПАДУ, Богу Ізраіля.
17 Але народ яшчэ складаў ахвяры на ўзвышшах, толькі [ўжо] ГОСПАДУ, Богу свайму.

18 А іншыя дзеяньні Манасы, і малітва ягоная да Бога свайго, і словы відушчых, якія прамаўлялі
да яго ў імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля, вось, яны ў летапісе валадароў Ізраіля.
19 А малітва ягоная, і як [Бог] быў упрошаны ім, і ўвесь грэх ягоны, і нявернасьць ягоная, і
месцы, на якіх ён пабудаваў узвышшы і паставіў Астартаў і балваноў перад скарэньнем сваім,
вось, яны запісаныя ў Летапісе Хазая.
20 І супачыў Манаса з бацькамі сваімі, і пахавалі яго ў доме ягоным. І пачаў валадарыць Амон,
сын ягоны, пасьля яго.
21 Дваццаць два гады было Амону, калі пачаў валадарыць, і ён валадарыў два гады ў Ерусаліме.
22 І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА, як рабіў Манаса, бацька ягоны, і ўсім балванам, якія зрабіў
Манаса, бацька ягоны, ён складаў ахвяры і служыў ім.
23 І ён не скарыўся перад абліччам ГОСПАДА, як скарыўся Манаса, бацька ягоны, але ён, Амон,
памножыў правіны [свае].
24 І змовіліся супраць яго слугі ягоныя, і забілі яго ў доме ягоным.
25 Але народ зямлі забіў усіх тых, якія змовіліся супраць валадара Амона; і народ зямлі
паставіў Ёсію, сына ягонага, за валадара пасьля яго.

2 Лет 34

1 Восем гадоў было Ёсіі, калі ён пачаў валадарыць, і трыццаць адзін год ён валадарыў у
Ерусаліме.
2 І рабіў ён слушнае ў вачах ГОСПАДА, і хадзіў шляхамі Давіда, бацькі свайго, і не адхіляўся ані
ўправа, ані ўлева.
3 А ў восьмым годзе валадараньня свайго, а ён быў яшчэ юнак, ён пачаў шукаць Бога Давіда,
бацькі свайго, а ў дванаццатым годзе пачаў ачышчаць Юду і Ерусалім ад узвышшаў, і ад
Астартаў, і ад ідалаў, і ад [ідалаў] літых.
4 І разбурылі перад ім ахвярнікі Баалаў; і выявы сонца, якія былі па-над імі, ён парэзаў; і
Астартаў, і ідалаў рэзьбленых і ідалаў літых ён скрышыў і сьцёр на пыл, і расьцярушыў на
абліччы магілаў тых, якія складалі ім ахвяры;
5 і косткі сьвятароў Баалаў ён спаліў на ахвярніках іхніх, і ачысьціў Юду і Ерусалім.
6 І ў гарадах Манасы, Эфраіма і Сымона аж да Нэфталі, і ў спустошаных ваколіцах іхніх
7 ён разьбіў ахвярнікі і Астартаў, і ідалаў рэзьбленых стоўк і сьцёр на пыл, і пасек усе выявы
сонца ў-ва ўсёй зямлі Ізраіля; і вярнуўся ў Ерусалім.
8 А ў васямнаццатым годзе валадараньня свайго, пасьля ачышчэньня зямлі і Дому [Божага],
ён паслаў Шафана, сына Ацаліі, і Маасэю, начальніка гораду, і Ёаха, сына Ёахаза, канцлера, каб
направіць Дом ГОСПАДА, Бога свайго.
9 І прыйшлі яны да Хількіі, вялікага сьвятара, і аддалі срэбра, прынесенае ў Дом Божы, якое
лявіты, што вартуюць парогі, сабралі з рук Манасы і Эфраіма і ўсёй рэшты Ізраіля, і ад усяго
Юды і Бэн'яміна, і ад жыхароў Ерусаліму,
10 і аддалі яго ў рукі тых, што рабілі працу, прызначаную для Дому ГОСПАДА, а тыя далі яго
працаўнікам, якія рабілі ў Доме ГОСПАДА, каб направіць і ўмацаваць Дом [Божы].
11 І яны далі цесьлярам і будаўнікам на купляньне чэсаных камянёў і дрэва на кроквы і бэлькі,
якія панішчылі валадары Юды.
12 І людзі гэтыя рабілі працу сумленна; і былі прызначаныя над імі Яхат і Абадыя, лявіты з
сыноў Мэрары, і Захарыя і Мэшулам з сыноў Кегата. І ўсе лявіты гэтыя зналіся на музычных
інструмэнтах.
13 І былі яны над тымі, якія носяць цяжары, і кіраўнікамі над тымі, якія рабілі працу пры ўсякім
служэньні. І з лявітаў [былі] і пісары, і наглядчыкі, і прыдзьвернікі.
14 І калі яны вымалі срэбра, прынесенае ў Дом ГОСПАДА, Хількія, сьвятар, знайшоў кнігу
Закону ГОСПАДА, [дадзеную] праз рукі Майсея.
15 І адказаў Хількія, і сказаў Шафану, пісару: «Я знайшоў кнігу Закону ў Доме ГОСПАДА». І
Хількія аддаў кнігу Шафану.

16 І прынёс Шафан кнігу валадару, і прынёс валадару слова, кажучы: «Усё, што даручана ў рукі
слугаў тваіх, яны робяць»;
17 І насыпалі срэбра, якое было знойдзенае ў Доме ГОСПАДА, і далі яго ў рукі кіраўнікоў
[працы] і ў рукі тых, што робяць працу.
18 І паведаміў Шафан пісар валадару, кажучы: «Кнігу даў мне Хількія сьвятар». І чытаў яе
Шафан перад абліччам валадара.
19 І сталася, калі пачуў валадар словы Закону, ён разьдзёр шаты свае.
20 І загадаў валадар Хількіі, і Ахікаму, сыну Шафана, і Абдону, сыну Міхі, і Шафану пісару, і
Асаі, слузе валадара, кажучы:
21 «Ідзіце, спытайцеся ў ГОСПАДА пра мяне і пра тых, што засталіся ў Ізраілі і ў Юдзе, адносна
словаў знойдзенай Кнігі гэтай. Бо вялікі гнеў ГОСПАДА, які выліты на нас за тое, што не
захоўвалі бацькі нашыя слова ГОСПАДА, каб выконваць усё, што напісана ў Кнізе гэтай».
22 І пайшоў Хількія і тыя, якіх [паслаў] валадар, да Хульды прарочыцы, жонкі Шальлюма, сына
Хасры, вартаўніка шатаў, — а яна жыла ў новай частцы Ерусаліму, — і аварылі з ёю пра гэта.
23 І яна сказала ім: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Скажыце чалавеку, які паслаў вас да мяне:
24 “Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я навяду ліха на месца гэтае і на жыхароў ягоных, усе праклёны,
напісаныя ў Кнізе, якую чыталі перад абліччам валадара Юды.
25 За тое, што яны пакінулі Мяне і кадзілі іншым багам, каб гнявіць Мяне ўсімі ўчынкамі рук
сваіх, гнеў Мой выльецца на месца гэтае і ня згасне”.
26 А валадару Юды, які паслаў вас спытацца ГОСПАДА, гэтак скажыце яму: “Гэта кажа ГОСПАД,
Бог Ізраіля, пра словы, якія ты чуў.
27 За тое, што зьмякчылася сэрца тваё, і ты ўпакорыўся перад абліччам Бога, калі пачуў словы
Ягоныя пра месца гэтае і пра жыхароў ягоных, і ты ўпакорыўся перад абліччам Маім, і разьдзёр
шаты свае, і плакаў перад абліччам Маім, Я таксама пачуў [цябе], кажа ГОСПАД.
28 Вось, Я далучу цябе да бацькоў тваіх, і ты будзеш далучаны да магілы тваёй у супакоі, і вочы
твае ня будуць бачыць усяго ліха, якое Я навяду на месца гэтае і на жыхароў ягоных”». І яны
вярнуліся да валадара са словам.
29 І паслаў валадар, і сабраў усіх старшыняў Юды і Ерусаліму.
30 І ўвайшоў валадар у Дом ГОСПАДА, і ўсе мужы Юды, і жыхары Ерусаліму, і сьвятары, і лявіты,
і ўвесь народ, ад вялікага аж да малога; і ён чытаў у вушы іхнія ўсе словы Кнігі Запавету, якая
была знойдзена ў Доме ГОСПАДА.
31 І стаў валадар на месцы сваім, і заключыў запавет перад абліччам ГОСПАДА, каб хадзіць за
ГОСПАДАМ і захоўваць прыказаньні Ягоныя, і сьведчаньні Ягоныя, і пастановы Ягоныя ўсім
сэрцам сваім і ўсёй душою сваёй, каб выконваць словы запавету, запісаныя ў Кнізе гэтай.
32 І ён схіліў усіх, што знаходзіліся ў Ерусаліме і ў Бэн’яміне, стаяць [у гэтым]. І жыхары
Ерусаліму рабілі паводле запавету Бога, Бога бацькоў сваіх.
33 І павыкідаў Ёсія ўсе брыдоты з усіх земляў сыноў Ізраіля, і схіліў усіх, што знаходзіліся ў
Ізраілі, служыць ГОСПАДУ, Богу іхняму. У-ва ўсе дні ягоныя яны не адступалі ад ГОСПАДА,
Бога бацькоў сваіх.

2 Лет 35

1 І справіў Ёсія ў Ерусаліме Пасху для ГОСПАДА, і зарэзалі пасхальнае [ягня] ў чатырнаццаты
дзень першага месяца.
2 І паставіў ён сьвятароў на пасады іхнія, і падбадзёрваў іх служыць у Доме ГОСПАДА.
3 І ён сказаў лявітам, якія вучылі ўвесь Ізраіль і былі пасьвячоныя для ГОСПАДА: «Пастаўце
Каўчэг Сьвяты ў Доме, які пабудаваў Салямон, сын Давіда, валадар Ізраіля. Ня будзе [ён]
цяжарам на рамёнах вашых. Цяпер служыце ГОСПАДУ, Богу вашаму, і народу Ягонаму,
Ізраілю.
4 І рыхтуючыся, падрыхтуйцеся па дамах бацькоў сваіх, па чэргах сваіх, паводле напісанага
Давідам, валадаром Ізраіля, і паводле напісанага Салямонам, сынам ягоным;
5 і стойце ў сьвятыні паводле падзелаў дамоў бацькоў, паводле братоў сваіх, сыноў народу, і
падзел гэты паводле дамоў бацькоў лявітаў.

6 І зарэжце пасхальнае [ягня], і асьвяціцеся, і прыгатуйце яго для братоў сваіх, робячы [гэта]
паводле слова ГОСПАДА, [дадзенага] праз рукі Майсея».
7 І даў Ёсія для сыноў народу, для ўсіх, што былі там, авечак, ягнятаў і маладых козаў, усё на
ахвяру пасхальную, лікам трыццаць тысячаў, і тры тысячы валоў. Гэта [ён даў] з маёмасьці
валадара.
8 І князі ягоныя давалі ахвотна народу, сьвятарам і лявітам. Хількія, Захарыя і Ехіэль,
начальнікі ў Доме Божым, далі сьвятарам на ахвяру пасхальную дзьве тысячы шэсьцьсот
[авечак] і трыста валоў.
9 А Хананія, Шэмая і Натанаэль, браты ягоныя, і Хашавія, Еіэль і Ёзавад, начальнікі лявітаў,
далі лявітам на ахвяру пасхальную пяць тысячаў [авечак] і пяцьсот валоў.
10 І было падрыхтавана служэньне. І сталі сьвятары на месцы свае, і лявіты — чэргамі сваімі,
паводле загаду валадара.
11 І рэзалі пасхальнае [ягня], і крапілі сьвятары крывёю з рук сваіх, а лявіты зьдзіралі [скуры].
12 І яны адклалі цэласпаленьні, каб даць паводле падзелаў дамоў бацькоў сынам народу
ахвяроўваць ГОСПАДУ, як напісана ў Кнізе Майсея. І гэтак сама зрабілі з валамі.
13 І пяклі пасхальнае [ягня] на агні, паводле пастановы, а ахвяры сьвятыя варылі ў катлах,
гаршчках і рондлях, і хутка несьлі ўсім сынам народу.
14 А потым прыгатавалі сабе і сьвятарам, бо сьвятары, сыны Аарона, былі пры ахвяраваньні
цэласпаленьняў і тлушчу аж да ночы, таму гатавалі лявіты сабе і сьвятарам, сынам Аарона.
15 І сьпевакі, сыны Асафа, былі на месцах сваіх паводле загаду Давіда і Асафа, і Гэмана, і
Едутуна, відушчага валадара, і прыдзьвернікі [стаялі] ў кожнай браме. Не было патрэбы
адыходзіць ім ад служэньня свайго, бо браты іхнія, лявіты, прыгатавалі ім.
16 Гэтак наладжана было ўсё служэньне ГОСПАДУ ў той дзень, каб справіць Пасху і ахвяраваць
цэласпаленьні на ахвярніку ГОСПАДА паводле загаду валадара Ёсіі.
17 І спраўлялі сыны Ізраіля, што былі [там], Пасху ў той час і Сьвята Праснакоў сем дзён.
18 І не была спраўляна такая Пасха ў Ізраілі ад дзён Самуэля прарока, і з усіх валадароў Ізраіля
ніводзін не спраўляў такой Пасхі, якую справіў Ёсія, і сьвятары, і лявіты і ўвесь Юда і Ізраіль,
што [там] былі, і жыхары Ерусаліму.
19 У васямнаццатым годзе валадараньня Ёсіі справілі гэтую Пасху.
20 Пасьля ўсяго гэтага, калі падрыхтаваў Ёсія Дом [Божы], прыйшоў Нэхо, валадар Эгіпту,
ваяваць супраць Кархемішу каля Эўфрату, і Ёсія выйшаў насустрач яму.
21 І той паслаў да яго паслоў, кажучы: «Што мне і табе, валадар Юды? Ня супраць цябе я іду
сёньня, але супраць дому, які ваюе са мною, і Бог сказаў мне пасьпяшацца. Адыйдзіся ад Бога,
Які са мною, і Ён ня зьнішчыць цябе».
22 Але Ёсія не адвярнуў аблічча свайго ад яго, бо вырашыў ваяваць з ім, і не паслухаў словаў
Нэхо, [якія былі] з вуснаў Божых, і пайшоў на бітву ў даліне Мэгіддо.
23 І стрэлілі лучнікі ў валадара Ёсію, і сказаў валадар слугам сваім: «Выведзіце мяне, бо я
цяжка паранены».
24 І зьнялі яго слугі ягоныя з калясьніцы, і пасадзілі яго ў іншы воз, які быў у яго, і завезьлі яго
ў Ерусалім. І ён памёр, і быў пахаваны ў магілах бацькоў сваіх, і ўвесь Юда і Ерусалім плакалі
па Ёсіі.
25 І галасіў Ярэмія па Ёсіі, і ўсе сьпевакі і сьпявачкі апавядаюць пра Ёсію ў галашэньнях сваіх
аж да сёньня, і ўвялі іх як звычай у Ізраілі, і вось яны запісаныя ў галашэньнях.
26 А іншыя дзеяньні Ёсіі і дабрадзействы ягоныя, згодныя з напісаным у Законе ГОСПАДА,
27 і дзеяньні ягоныя, першыя і апошнія, запісаныя ў Кнізе валадароў Ізраіля і Юды.

2 Лет 36

1 І ўзяў народ зямлі Егаахаза, сына Ёсіі, і паставілі яго за валадара ў Ерусаліме пасьля бацькі
ягонага.
2 Дваццаць тры гады было Егаахазу, калі ён пачаў валадарыць, і тры месяцы ён валадарыў у
Ерусаліме.

3 І скінуў [з пасаду] яго ў Ерусаліме валадар Эгіпту, і налажыў на зямлю кару ў сто талентаў
срэбра і талент золата.
4 І валадар Эгіпту паставіў за валадара над Юдам і Ерусалімам Эліякіма, брата ягонага, і
зьмяніў імя ягонае на Егаякім, а Егаахаза, брата ягонага, узяў Нэхо і завёў яго ў Эгіпет.
5 Дваццаць пяць гадоў было Егаякіму, калі ён пачаў валадарыць, і адзінаццаць гадоў ён
валадарыў у Ерусаліме. І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА, Бога свайго.
6 Супраць яго прыйшоў Навухаданосар, валадар Бабілону, і закаваў яго ў кайданы мядзяныя,
каб завесьці яго ў Бабілон.
7 І начыньні Дому ГОСПАДА завёз Навухаданосар у Бабілон, і палажыў іх у палацы сваім у
Бабілоне.
8 А іншыя дзеяньні Егаякіма і брыдоты ягоныя, якія ён рабіў, і якія знойдзены ў яго, вось, яны
запісаны ў Кнізе валадароў Ізраіля і Юды. І пачаў валадарыць Егаяхін, сын ягоны, пасьля яго.
9 Восемь гадоў было Егаяхіну, калі ён пачаў валадарыць, і тры месяцы і дзесяць дзён ён
валадарыў у Ерусаліме. І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА.
10 І на наступны год паслаў валадар Навухаданосар, і прывёў яго ў Бабілон разам з каштоўным
начыньнем Дому ГОСПАДА, і паставіў за валадара над Юдам і Ерусалімам Сэдэкію, брата
ягонага.
11 Дваццаць адзін год быў Сэдэкіі, калі ён пачаў валадарыць, і адзінаццаць гадоў ён валадарыў
у Ерусаліме.
12 І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА, Бога свайго. Ён не ўпакорыўся перад абліччам Ярэміі
прарока, [які гаварыў] з вуснаў ГОСПАДА.
13 І таксама ён збунтаваўся супраць валадара Навухаданосар, які ўзяў з яго прысягу перад
Богам, і зрабіў цьвёрдым карак свой, і закамяніў сэрца сваё, каб не навярнуцца да ГОСПАДА,
Бога Ізраіля.
14 Таксама ўсе начальнікі, сьвятары і народ памнажалі нявернасьць сваю паводле ўсіх
брыдотаў народаў, і ганьбілі Дом ГОСПАДА, які Ён асьвяціў у Ерусаліме.
15 І пасылаў ГОСПАД, Бог бацькоў іхніх, да іх пасланцоў Сваіх, рана ўстаючы і пасылаючы, бо
меў Ён спагаду да народу Свайго і да Сялібы Сваёй.
16 Але яны сьмяяліся з пасланцоў Божых, і грэбавалі словам Ягоным, і зьдзекваліся з прарокаў
Ягоных, аж узьняўся гнеў ГОСПАДА на народ Ягоны, ажно не было лекаваньня.
17 І Ён прывёў на іх валадара Халдэйскага, і той пазабіваў мячом юнакоў іхніх у Доме Сьвятыні
іхняй, і не пашкадаваў ані юнака, ані дзяўчыны, ані старога, ані сівога, усё аддаў у рукі ягоныя.
18 І ўсе начыньні Дому Божага, вялікія і малыя, і скарбы Дому ГОСПАДА, і скарбы валадара і
князёў ягоных, усё завёз ён у Бабілон.
19 І спалілі Дом Божы, і зруйнавалі муры Ерусаліму, і ўсе палацы ягоныя спалілі агнём, і ўсе
каштоўныя рэчы ягоныя зьнішчылі.
20 І перасяліў ён тых, якія засталіся ад мяча, у Бабілон, і былі яны слугамі ягонымі і сыноў
ягоных аж да пачатку валадараньня валадарства Пэрсаў,
21 каб споўнілася слова ГОСПАДА праз вусны Ярэміі: «Аж пакуль зямля не задаволіцца за
суботы свае, усе дні спусташэньня ейнага будзе яна супачываць да сканчэньня сямідзесяці
гадоў».
22 А ў першы год Кіра, валадара Пэрсаў, каб споўнілася слова ГОСПАДА праз вусны Ярэміі,
узрушыў ГОСПАД дух Кіра, валадара Пэрсаў, і ён абвясьціў у-ва ўсім валадарстве сваім, і
таксама пісьмова, кажучы:
23 «Гэта кажа Кір, валадар Пэрсаў. Усе валадарствы зямлі даў мне ГОСПАД, Бог нябесны. І Ён
загадаў мне пабудаваць Яму Дом у Ерусаліме, які ў Юдэі. Хто ёсьць з вас з народу Ягонага,
[няхай будзе] ГОСПАД, Бог ягоны, з ім, і няхай ён узыйдзе [ў Ерусалім]».

КНІГА ЭЗРЫ

1 У першы год Кіра, валадара Пэрсаў, каб споўнілася слова ГОСПАДА з вуснаў Ярэміі, узрушыў
ГОСПАД дух Кіра, валадара Пэрсаў, і ён абвясьціў у-ва ўсім валадарстве сваім, а таксама
пісьмова, кажучы:
2 «Гэтак кажа Кір, валадар Пэрсаў: “Усе валадарствы зямлі даў мне ГОСПАД, Бог нябесны. І Ён
загадаў мне пабудаваць Дом Яму ў Ерусаліме, які ў Юдэі.
3 Калі ёсьць хто з вас з усяго народу Ягонага, няхай Бог ягоны будзе з ім, і няхай узыйдзе ён у
Ерусалім, які ў Юдэі, і няхай будуе Дом ГОСПАДА, Бога Ізраіля. Гэта той Бог, Які ў Ерусаліме.
4 І ўсе, якія засталіся ў-ва ўсіх месцах, дзе яны жывуць, няхай дапамогуць ім людзі месца таго
срэбрам, золатам, маёмасьцю і быдлам, а таксама дабраахвотнымі дарамі для Дому Бога, Які
ў Ерусаліме”».
5 І паўсталі начальнікі родаў Юды і Бэн’яміна, і сьвятары, і лявіты, і кожны, у якога дух
узрушыў Бог, каб ісьці будаваць Дом ГОСПАДА, які ў Ерусаліме.
6 І ўсе тыя, што жылі навокал, умацоўвалі рукі іхнія начыньнямі са срэбра, золатам,
маёмасьцю, быдлам і каштоўнасьцямі, апрача дароў дабраахвотных.
7 І валадар Кір вынес начыньне Дому ГОСПАДА, якое Навухаданосар вынес з Ерусаліму і
палажыў у доме бога свайго.
8 І вынес яго Кір, валадар Пэрсаў, рукамі Мітрэдата, скарбніка, і тым лікам аддаў іх Шэшбацару,
князю Юды.
9 І вось лік іхні: місаў залатых — трыццаць, місаў срэбных — тысяча, нажоў — дваццаць
дзевяць,
10 келіхаў залатых — трыццаць, келіхаў срэбных другарадных — чатырыста дзесяць, іншага
начыньня — тысяча.
11 Усяго начыньня залатога і срэбнага — пяць тысячаў чатырыста. Усё гэта прынёс Шэшбацар,
калі прыйшлі з выгнаньня з Бабілону ў Ерусалім.

Эзр 2

1 Гэта сыны краіны [Юдэйскай], якія ўзыходзілі з палону выгнаньня, бо іх Навухаданосар,
валадар Бабілонскі, перасяліў у Бабілон, і яны вярнуліся ў Ерусалім і Юдэю, кожны ў горад
свой.
2 Яны прыйшлі з Зэрубабэлем, Ешуам, Нээміем, Сэраем, Рээлаем, Мардэхаем, Більшанам,
Міспарам, Бігваем, Рэхумам, Баанам. Лік мужоў народу Ізраіля:
3 сыноў Пароша — дзьве тысячы сто семдзясят два;
4 сыноў Шэфатыі — трыста семдзясят два;
5 сыноў Араха — семсот семдзясят пяць;
6 сыноў Пахат-Маава, з сыноў Ешуа і Ёава — дзьве тысячы васемсот дванаццаць;
7 сыноў Эляма — тысяча дзьвесьце пяцьдзясят чатыры;
8 сыноў Затту — дзевяцьсот сорак пяць;
9 сыноў Заккая — семсот шэсьцьдзясят;
10 сыноў Бані — шэсьцьсот сорак два;
11 сыноў Бэвая — шэсьцьсот дваццаць тры;
12 сыноў Азгада — тысяча дзьвесьце дваццаць два;
13 сыноў Аданікама — шэсьцьсот шэсьцьдзясят шэсьць;
14 сыноў Бігвая — дзьве тысячы пяцьдзясят шэсьць;
15 сыноў Адына — чатырыста пяцьдзясят чатыры;
16 сыноў Атэра, з [сыноў] Эзэкіі — дзевяноста восем;
17 сыноў Бэцая — трыста дваццаць тры;
18 сыноў Ёры — сто дванаццаць;
19 сыноў Хашума — дзьвесьце дваццаць тры;

20 сыноў Гіббара — дзевяноста пяць;
21 сыноў Бэтлеему — сто дваццаць тры;
22 людзей Нэтофы — пяцьдзясят шэсьць;
23 людзей Анатоту — сто дваццаць восем;
24 сыноў Азмавэту — сорак два;
25 сыноў Кірыят-Ярыму, Кефіры і Бээроту — семсот сорак тры;
26 сыноў Рамы і Гевы — шэсьцьсот дваццаць адзін;
27 людзей Міхмасу — сто дваццаць два;
28 людзей Бэтэлю і Гаю — дзьвесьце дваццаць тры;
29 сыноў Нэво — пяцьдзясят два;
30 сыноў Магбіша — сто пяцьдзясят шэсьць;
31 сыноў Эляму другога — тысяча дзьвесьце пяцьдзясят чатыры;
32 сыноў Харыму — трыста дваццаць:
33 сыноў Лода, Хадыда і Она — семсот дваццаць пяць;
34 сыноў Ерыхону — трыста сорак пяць;
35 сыноў Сэнаі — тры тысячы шэсьцьсот трыццаць;
36 сьвятароў: сыноў Едаі, з дому Ешуа, — дзевяцьсот семдзясят тры;
37 сыноў Іммэра — тысяча пяцьдзясят два;
38 сыноў Пашхура — тысяча дзьвесьце пяцьдзясят сем;
39 сыноў Харыма — тысяча сямнаццаць;
40 лявітаў: сыноў Ешуа і Кадміэля, з сыноў Гадавіі, — семдзясят чатыры;
41 сьпевакоў, сыноў Асафа, — сто дваццаць восем;
42 сыноў прыдзьвернікаў: сыноў Шальлюма, сыноў Атэра, сыноў Тальмона, сыноў Аккува, сыноў Хатыты, сыноў Шавая, усіх — трыццаць дзевяць;
43 нэтынэяў: сыноў Цыхі, сыноў Хасуфы, сыноў Табаота,
44 сыноў Кероса, сыноў Сіяхі, сыноў Падона,
45 сыноў Лебаны, сыноў Хагавы, сыноў Аккува,
46 сыноў Хагава, сыноў Шамлая, сыноў Ханана,
47 сыноў Гіддэля, сыноў Гахара, сыноў Рэаі,
48 сыноў Рэцына, сыноў Нэкоды, сыноў Газама,
49 сыноў Узы, сыноў Пасэаха, сыноў Бэсая,
50 сыноў Асны, сыноў Мэуніма, сыноў Нэфусіма,
51 сыноў Бакбука, сыноў Хакуфы, сыноў Хархура,
52 сыноў Бацлюта, сыноў Мэхіды, сыноў Харшы,
53 сыноў Баркоса, сыноў Сісэры, сыноў Тэмаха,
54 сыноў Нецыяха, сыноў Хатыфы;
55 сыноў слугаў Салямонавых: сыноў Сатая, сыноў Гасафэрэта, сыноў Пэруда,
56 сыноў Яалія, сыноў Даркона, сыноў Гіддэля,
57 сыноў Шэфатыі, сыноў Хатылы, сыноў Пахерэт-Гацэбаіма, сыноў Амі,
58 нэтынэяў і сыноў слугаў Салямонавых — трыста дзевяноста два.
59 А гэтыя выйшлі з Тэль-Мэляху, Тэль-Харшы, Керуву, Аддану, Іммэру, і не маглі паказаць дому бацькоў сваіх і насеньня свайго, ці яны з Ізраіля:
60 сыноў Дэлаі, сыноў Товіі, сыноў Нэкоды — шэсьцьсот пяцьдзясят два;
61 і з сыноў сьвятароў: сыноў Хабаі, сыноў Гаккоца, сыноў Барзілая, які ўзяў за жонку дачку Барзілая з Гілеаду і называўся імем ягоным.
62 Яны шукалі запісу свайго ў сьпісах, і не знайшоўся ён; і яны былі адлучаны ад сьвятарства.
63 І Тыршата сказаў ім, каб яны ня елі са Сьвятога Сьвятых, пакуль не паўстане сьвятар з урымам і тумімам.
64 Уся царква [была] разам сорак дзьве тысячы трыста шэсьцьдзясят [чалавек],

65 акрамя слугаў іхніх і служак іхніх, якіх [было] сем тысячаў трыста трыццаць сем, і сярод іх
сьпевакоў і сьпявачак — дзьвесьце.
66 Коней іхніх [было] семсот трыццаць шэсьць; мулаў іхніх — дзьвесьце сорак пяць;
67 вярблюдаў іхніх — чатырыста трыццаць пяць; аслоў — шэсьць тысячаў семсот дваццаць.
68 І [некаторыя] з галоваў [дамоў] бацькоў, калі яны прыйшлі да Дому ГОСПАДА, які ў
Ерусаліме, дабраахвотна ахвяравалі на Дом Божы, каб адбудаваць яго на месцы ягоным.
69 Яны далі, паводле магчымасьці сваёй, у скарбніцу для работаў шэсьцьдзясят адну тысячу
драхмаў золата, і пяць тысячаў мінаў срэбра, і сто шатаў сьвятарскіх.
70 І жылі сьвятары і лявіты, і [некаторыя] з народу, і сьпевакі, і прыдзьвернікі, і нэтынэі ў
гарадах сваіх, і ўвесь Ізраіль [жыў] у гарадах сваіх.

Эзр 3

1 І прыйшоў сёмы месяц, і сыны Ізраіля [былі] ў гарадах, і сабраўся народ, як адзін чалавек, у
Ерусаліме.
2 І ўстаў Ешуа, сын Ёцадака, і браты ягоныя, сьвятары, і Зэрубабэль, сын Шэалтыэля, і браты
ягоныя; і пабудавалі ахвярнік Бога Ізраіля, каб ахвяроўваць на ім цэласпаленьні, як напісана
ў Законе Майсея, чалавека Божага.
3 І паставілі ахвярнік на падмурку ягоным, хоць [былі] ў страху ад народу зямлі гэтай, і склалі
на ім цэласпаленьні для ГОСПАДА, цэласпаленьні ранішнія і вечаровыя.
4 І справілі Сьвята Намётаў, як напісана, і [складалі] цэласпаленьні штодзённыя лікам паводле
пастановы, як павіннасьць кожнага дня [вымагала].
5 А пасьля гэтага — цэласпаленьне заўсёднае, і на маладзік, і на ўсе ўрачыстыя сьвяты
ГОСПАДА, і для кожнага, хто ахвяруе дабраахвотную ахвяру ГОСПАДУ.
6 З першага дня сёмага месяца пачалі складаць цэласпаленьні для ГОСПАДА. Але для Сьвятыні
ГОСПАДА не былі яшчэ закладзены [падмуркі].
7 І далі яны срэбра мулярам і цесьлярам, і ежу, і пітво, і алей для Сідонцаў і Тырыянаў, каб
прывезьлі дрэвы кедровыя з Лібану да мора Яфскага з дазволу Кіра, валадара Пэрсаў.
8 І ў другім годзе пасьля прыходу іхняга да Дому Божага ў Ерусалім, у другі месяц, пачалі
[будаваць] Зэрубабэль, сын Шэалтыэля, і Ешуа, сын Ёцадака, і рэшта братоў іхніх, сьвятары і
лявіты, і ўсе, што ўзыйшлі з палону ў Ерусалім, і паставілі лявітаў ад дваццаці гадоў і вышэй
кіраваць працамі ў Доме ГОСПАДА.
9 І сталі Ешуа, сыны ягоныя і браты ягоныя, Кадміэль і сыны ягоныя, сыны Юды, як адзін
[чалавек], каб кіраваць выкананьнем працаў у Доме Божым, [разам з] сынамі Хэнадада,
сынамі іхнімі і братамі іхнімі, лявітамі.
10 І заклалі будаўнікі падмурак Сьвятыні ГОСПАДА, і паставілі сьвятароў у шатах іхніх з
трубамі, а лявітаў, сыноў Асафа, — з цымбаламі, каб хвалілі ГОСПАДА паводле пастановы
Давіда, валадара Ізраіля.
11 І адказалі яны хвалою і праслаўленьнем ГОСПАДА, бо добры Ён, бо на вякі міласэрнасьць
Ягоная для Ізраіля. І ўвесь народ усклікаў голасам вялікім, хвалячы ГОСПАДА за закладзены
падмурак Дому ГОСПАДА.
12 І шмат хто са сьвятароў і лявітаў, і галоваў [дамоў] бацькоў, старых, якія бачылі першы
Дом [Божы], калі падмуркі Дому гэтага былі закладзены перад вачыма іхнімі, плакалі голасам
вялікім; а шмат хто ўсклікаў голасам узьнесеным з радасьцю.
13 І ня мог народ адрозьніць голасу гуканьня радасьці ад голасу плачу народу, бо народ гукаў
ускліканьнем вялікім, і гук быў чуваць далёка.

Эзр 4

1 І пачулі ворагі Юды і Бэн’яміна, што сыны выгнаньня будуюць Дом для ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
2 І прыйшлі яны да Зэрубабэля і да галоваў [дамоў] бацькоў, і сказалі ім: «Будзем і мы будаваць
з вамі, бо і мы, як і вы, шукаем Бога вашага і ахвяруем ахвяры Яму ад дзён Эсар-Гадона,
валадара Асірыі, які прывёў нас сюды».

3 І сказаў ім Зэрубабэль і Ешуа, і іншыя галовы [дамоў] бацькоў Ізраіля: «Не будаваць вам і нам
[разам] Дом Богу нашаму. Мы адны будзем будаваць для ГОСПАДА, Бога Ізраіля, як загадаў
нам Кір, валадар Пэрсаў».
4 І стаў народ зямлі той паслабляць рукі народу Юды і палохаць іх пры будаўніцтве.
5 І наймалі супраць іх дарадцаў [валадара], каб разбурыць намер іхні, праз усе дні Кіра,
валадара Пэрсаў, аж да валадараньня Дарыя, валадара Пэрсаў.
6 А ў валадараньне Ахашвэроша, на пачатку валадараньня ягонага, напісалі скаргу на жыхароў
Юды і Ерусаліму.
7 І ў дні Артаксэркса напісалі Бішлам, Мітрэдат, Табээль і іншыя таварышы іхнія да
Артаксэркса, валадара Пэрсаў. І ліст быў напісаны па-арамейску і перакладзены на мову
арамейскую.
8 Рэхум канцлер і Шымшай пісар напісалі адзін ліст супраць Ерусаліму да валадара
Артаксэркса гэтак:
9 «Тады і тады. Рэхум канцлер, і Шымшай пісар, і іншыя таварышы іхнія — Дынэйцы,
Афарсатхейцы, Тарпэлейцы, Афарсэйцы, Архейцы, Бабілонцы, Шушанцы, Дэгайцы, Элямцы,
10 і іншыя народы, якіх перасяліў Аснапар, вялікі і славуты, і пасяліў у горадзе Самарыі і ў
іншых [мясцовасьцях] Зарэчча, і іншае».
11 Гэта водпіс лісту, які пасланы да [валадара]: «Артаксэрксу валадару — слугі слугаў тваіх,
людзі Зарэчча, і іншае.
12 Няхай будзе вядома валадару, што Юдэі, якія выйшлі ад цябе, прыйшлі да нас у Ерусалім, і
горад бунтаўнічы і нягодны адбудоўваюць, і муры аднаўляюць, і падмуркі напраўляюць.
13 Цяпер няхай будзе вядома валадару, што калі горад гэты будзе адбудаваны і муры
адноўленыя, ня будуць яны плаціць ані даніны, ані падатку, ані мыта, і прыбытку валадара
будзе шкода.
14 І вось, мы солім [ежу] сольлю з палацу [валадара], і зьнявагі валадару ня можам бачыць.
Дзеля гэтага пасылаем і паведамляем валадару.
15 Няхай пашукаюць у кнізе запісаў бацькоў тваіх, і знойдзеш у кнізе запісаў, і даведаешся, што
горад гэты — горад бунтаўнічы і шкодзіць валадарам і краям, і бунты паднімаюць у ім з дзён
старадаўніх. За гэта горад гэты быў зруйнаваны.
16 Мы паведамляем валадару, што калі горад гэты будзе адбудаваны і муры ягоныя будуць
адноўленыя, з гэтай прычыны ня будзе ў цябе часткі ў Зарэччы».
17 Валадар паслаў адказ: «Рэхуму канцлеру, і Шымшаю пісару, і іншым таварышам іхнім, якія
жывуць у Самарыі і ў іншых [мясцовасьцях] Зарэчча. Супакой і іншае.
18 Ліст, які вы прыслалі нам, выразна прачыталі перада мною.
19 І ад мяне выйшаў загад, і шукалі, і знайшлі, што горад гэты з дзён старадаўніх паўставаў
супраць валадароў, і былі ў ім бунты і паўстаньні,
20 і былі ў Ерусаліме валадары магутныя, якія панавалі ў-ва ўсім Зарэччы, і ім давалі даніну,
падаткі і мыта.
21 І цяпер дайце загад, каб людзі гэтыя спыніліся і горад гэты не адбудоўваўся, пакуль ад мяне
ня выйдзе [новы] загад.
22 І будзьце ўважлівыя, каб не зрабіць у гэтым недагляду. Навошта мае павялічвацца зло на
шкоду валадарам?»
23 Як толькі водпіс гэтага ліста ад валадара Артаксэркса быў прачытаны перад Рэхумам і
Шымшаем пісарам, і таварышамі іхнімі, яны, сьпяшаючыся, пайшлі ў Ерусалім да Юдэяў і
спынілі [працу] іхнюю зброяй і гвалтам.
24 Тады спынілася праца пры Доме Божым, які ў Ерусаліме; і спынілася яна аж да другога году
валадараньня Дарыя, валадара Пэрсаў.

Эзр 5

1 І прарочылі прароцтвы Агей прарок і Захарыя, сын Іддо, прарокі, да Юдэяў, якія [былі] ў Юдэі
і ў Ерусаліме, у імя Бога Ізраіля, [Які] над імі.

2 Тады ўсталі Зэрубабэль, сын Шэалтыэля, і Ешуа, сын Ёцадака, і пачалі будаваць Дом Божы ў
Ерусаліме, і з імі прарокі Божыя, якія дапамагалі ім.
3 У той час прыйшоў да іх Татэнай, ваявода Зарэчча, і Шэтар-Базэнай, і таварышы іхнія, і гэтак
сказалі ім: «Хто даў вам дазвол будаваць Дом гэты і аднаўляць сьцены гэтыя?»
4 Тады мы сказалі ім імёны тых людзей, якія будуюць будынак гэты.
5 І было вока Бога іхняга над старшынямі Юдэйскімі, і тыя не спынілі іх, [чакаючы], пакуль
яны пашлюць паведамленьне Дарыю, і тады прыйдзе пісьмовая пастанова ў справе гэтай.
6 [Вось] водпіс лісту, які паслаў Татэнай, ваявода Зарэчча, і Шэтар-Базэнай з таварышамі
сваімі, Афарсатхейцамі з Зарэчча, валадару Дарыю.
7 Паведамленьне яны паслалі яму, і ў ім было напісана гэтак: «Дарыю, валадару — супакой
усялякі!
8 Няхай будзе вядома валадару, што мы хадзілі ў краіну Юдэйскую, да Дому Бога вялікага; і
будуюць яго з камянёў вялікіх, і дрэва ўкладаюць у сьцены; і праца гэтая робіцца старанна і з
посьпехам у руках іхніх.
9 Тады мы спыталіся ў старшыняў тых і гэтак сказалі ім: “Хто даў вам загад будаваць дом гэты
і сьцены гэтыя аднаўляць?”
10 І звыш таго пра імёны іхнія мы спыталіся ў іх, каб паведаміць табе і напісаць імёны тых
людзей, якія галоўныя ў іх.
11 І яны так адказалі нам, кажучы: “Мы — слугі Бога неба і зямлі, і будуем Дом, які быў
пабудаваны шмат гадоў таму, і вялікі валадар у Ізраілі будаваў яго і скончыў [будаўніцтва].
12 Але бацькі нашыя ўгнявілі Бога нябеснага, і Ён аддаў іх у руку Навухаданосара, валадара
Бабілону, Халдэйца; і Дом гэты ён зруйнаваў, і народ перасяліў у Бабілон.
13 Але ў першы год Кіра, валадара Бабілону, валадар Кір даў загад адбудаваць гэты Дом Божы.
14 І начыньне Дому Божага, залатое і срэбнае, якое Навухаданосар вынес са сьвятыні ў
Ерусаліме і перанёс яго ў сьвятыню ў Бабілоне, Кір, валадар, вынес са сьвятыні ў Бабілоне,
і яно было прывезена [чалавеку], якога імя Шэшбацар, якога ён прызначыў ваяводам
15 і сказаў яму: "Вазьмі гэтае начыньне і ідзі, занясі яго ў сьвятыню, якая ў Ерусаліме, і няхай
Дом Божы будзе адбудаваны на месцы сваім".
16 Тады прыйшоў той Шэшбацар і заклаў падмуркі Дому Божага, які ў Ерусаліме; і ад таго часу
аж дагэтуль ён будуецца і яшчэ ня скончаны”.
17 І цяпер, калі валадару гэта [падаецца] добрым, няхай пашукаюць у доме скарбаў валадара,
там, у Бабілоне, ці сапраўды валадар Кір даў загад будаваць гэты Дом Божы ў Ерусаліме; і волю
валадара пра гэта няхай прышлюць нам».

Эзр 6

1 Тады валадар Дарый даў загад, і шукалі ў Бабілоне, у доме кнігаў, дзе складаюць скарбы.
2 І знойдзены ў замку Ахмэце, у палацы, які ў краіне Мідзянаў, адзін сувой, і ў ім напісана так:
«Каб памятаць.
3 У першы год валадара Кіра, валадар Кір даў загад пра Дом Божы ў Ерусаліме: “Няхай будзе
адбудаваны Дом на тым месцы, дзе ахвяроўваюць ахвяры, і няхай падмуркі ягоныя будуць
захаваныя. Вышыня ягоная — шэсьцьдзясят локцяў, шырыня ягоная — шэсьцьдзясят локцяў.
4 Шэрагаў з камянёў вялікіх — тры, і шэраг з дрэва — адзін. На выдаткі няхай даюць з дому
валадара.
5 І начыньне Дому Божага, залатое і срэбнае, якое Навухаданосар вынес са сьвятыні ў
Ерусаліме і перанёс у Бабілон, няхай будзе вернута і пойдзе ў сьвятыню ў Ерусаліме, на месца
сваё, і паложыш [яго] ў Доме Божым”.
6 І цяпер, Татэнай, ваявода Зарэчча, і Шэтар-Базэнай, і таварышы вашыя Афарсатхейцы, якія ў
Зарэччы, — аддаліцеся адтуль.
7 Пакіньце [ў супакоі] працу пры гэтым Доме Божым. Няхай ваявода Юдэйскі і старшыні
Юдэйскія будуюць гэты Дом Божы на месцы ягоным.

8 І я даю загад пра тое, што вы маеце рабіць для гэтых старшыняў Юдэйскіх у будаўніцтве
гэтага Дому Божага: з маёмасьці валадара, з падаткаў Зарэчча, старанна вяртайце выдаткі
тых людзей, каб работа не спынялася.
9 І што будзе патрэбна, і бычкоў, і бараноў, і ягнятаў, на цэласпаленьне для Бога нябеснага,
пшаніцы, солі, віна і алею, як скажуць сьвятары ў Ерусаліме, няхай выдаюць ім дзень у дзень,
без занядбаньня,
10 каб яны ахвяроўвалі ахвяры, прыемныя Богу нябеснаму, і маліліся за жыцьцё валадара і
сыноў ягоных.
11 І я даю загад, што кожнаму чалавеку, які зьменіць гэтае слова, будзе вынята бервяно з дому
ягонага, і ён будзе падняты і прыбіты да яго, а дом ягоны за гэта будзе ператвораны ў руіну.
12 І Бог, Які зьмясьціў там імя Сваё, няхай зьнішчыць кожнага валадара і народ, які выцягнуў
бы руку сваю, каб зьмяніць гэта на шкоду гэтаму Дому Божаму ў Ерусаліме. Я, Дарый, даў
гэты загад. Няхай ён будзе дакладна выкананы».
13 Тады Татэнай, ваявода Зарэчча, Шэтар-Базэнай і таварышы іхнія, як загадаў Дарый валадар,
так дакладна і зрабілі.
14 І старшыні Юдэйскія будавалі, і мелі посьпех паводле прароцтва Агея прарока і Захарыі,
сына Іддо. І пабудавалі, і скончылі паводле загаду Бога Ізраіля і паводле загаду Кіра, і Дарыя,
і Артаксэркса, валадароў Пэрсаў.
15 І быў скончаны Дом гэты ў трэці дзень месяца Адар у шостым годзе валадараньня Дарыя
валадара.
16 І справілі сыны Ізраіля, сьвятары і лявіты, і рэшта сыноў выгнаньня [сьвята] асьвячэньня
гэтага Дому Божага з радасьцю.
17 І ахвяравалі на асьвячэньне гэтага Дому Божага сто бычкоў, дзьвесьце бараноў, чатырыста
ягнятаў і дванаццаць казлоў у ахвяру за грэх за ўсяго Ізраіля, паводле ліку каленаў Ізраіля.
18 І паставілі сьвятароў паводле служэньняў іхніх, і лявітаў паводле чэргаў іхніх на служэньне
[Дому] Божага, які ў Ерусаліме, паводле напісанага ў кнізе Майсея.
19 І сыны выгнаньня сьвяткавалі Пасху ў чатырнаццаты [дзень] першага месяца,
20 бо ачысьціліся сьвятары і лявіты; усе яны, як адзін, былі чыстыя; і зарэзалі [ягня] пасхальнае
для ўсіх сыноў выгнаньня, братоў сваіх, і для сьвятароў, і для сябе.
21 І елі сыны Ізраіля, якія вярнуліся з выгнаньня, і ўсе, што аддзяліліся да іх ад нячыстасьці
народаў зямлі, каб шукаць ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
22 І сьвяткавалі Сьвята Праснакоў сем дзён з радасьцю, бо ГОСПАД узрадаваў іх і зьвярнуў да іх
сэрца валадара Асірыі, каб умацаваць рукі іхнія пры будаўніцтве Дому ГОСПАДА, Бога Ізраіля.

Эзр 7

1 І пасьля гэтых здарэньняў, у валадараньне Артаксэркса, валадара Пэрсаў, Эзра, сын Сэраі,
сына Азарыі, сына Хількіі,
2 сына Шальлюма, сына Цадока, сына Ахітува,
3 сына Амарыі, сына Азарыі, сына Мэраёта,
4 сына Зэрахіі, сына Узі, сына Буккі,
5 сына Абішуа, сына Пінхаса, сына Элеазара, сына Аарона, найвышэйшага сьвятара, —
6 гэты Эзра выйшаў з Бабілону. Ён быў кніжнік, знаўца Закону Майсеевага, які даў ГОСПАД, Бог
Ізраіля. І даў яму валадар усё паводле ўсякай просьбы ягонай, бо рука ГОСПАДА, Бога ягонага,
[была] на ім.
7 І ўзыйшлі ў Ерусалім некаторыя з сыноў Ізраіля і са сьвятароў, лявітаў, сьпевакоў,
прыдзьвернікаў і нэтынэяў у сёмы год валадара Артаксэркса.
8 І прыйшоў ён у Ерусалім у пяты месяц сёмага году валадара;
9 бо ў першы [дзень] першага месяца пачаў ён узыходзіць з Бабілону, і ў першы [дзень] пятага
месяца прыйшоў у Ерусалім, бо добрая рука Бога ягонага [была] над ім.
10 Бо Эзра ўмацаваў сэрца сваё, каб дасьледаваць Закон ГОСПАДА, і захоўваць [яго], і вучыць у
Ізраілі пастановы і прысуды [ягоныя].

11 І вось водпіс лісту, які даў валадар Артаксэркс Эзры сьвятару, кніжніку, кніжніку словаў
прыказаньняў ГОСПАДА і пастановаў Ягоных для Ізраіля:
12 «Артаксэркс, валадар валадароў, — Эзры сьвятару, кніжніку Закону Бога нябеснага і гэтак
далей.
13 Ад мяне выдадзены загад, што ўсе з народу Ізраіля, і са сьвятароў і лявітаў у валадарстве
маім, якія жадаюць дабраахвотна ісьці ў Ерусалім, няхай ідуць з табою,
14 бо цябе пасылае валадар і сем дарадцаў ягоных, каб наведаць Юдэю і Ерусалім паводле
Закону Бога твайго, які ў руцэ тваёй,
15 і завезьці срэбра і золата, якія валадар і дарадцы ягоныя дабраахвотна ахвяравалі Богу
Ізраіля, у Якога сяліба ў Ерусаліме,
16 і ўсё срэбра і золата, якое ты знойдзеш у-ва ўсёй краіне Бабілонскай, разам з дабраахвотнымі
дарамі народу і сьвятароў, якія дабраахвотна даюць на Дом Бога свайго, які ў Ерусаліме.
17 Дзеля гэтага без затрымкі купі за гэтыя грошы валоў, бараноў, ягнятаў і ахвяры хлебныя
іхнія, і ахвяры вадкія іхнія, і ахвяруеш іх на ахвярніку ў Доме Бога вашага ў Ерусаліме.
18 І што падаецца добрым табе і братам тваім зрабіць з рэшты срэбра і золата, рабіце паводле
волі Бога вашага.
19 І начыньне, якое дадзена табе для служэньня ў Доме Бога твайго, пастаў перад Богам у
Ерусаліме.
20 І іншыя [рэчы], патрэбныя для Дому Бога твайго, што трэба даць табе, возьмеш з дому
скарбаў валадара.
21 І ад мяне, валадара Артаксэркса, выдадзены загад для ўсіх скарбнікаў, якія ў Зарэччы: усё,
чаго будзе жадаць ад вас Эзра сьвятар, кніжнік Закону Бога нябеснага, давайце дакладна:
22 срэбра — да ста талентаў, і пшаніцы — да ста кораў, і віна — да ста батаў, і алею — да ста
батаў, а солі — без запісу.
23 Усё паводле загаду Бога нябеснага павінна быць зроблена рупліва для Дому Бога нябеснага.
Бо навошта быў бы гнеў [Ягоны] на валадарства валадара і сыноў ягоных?
24 І паведамляем вам, што на ўсіх сьвятароў, лявітаў, сьпевакоў, прыдзьвернікаў, нэтынэяў і
служыцеляў пры гэтым Доме Божым нельга накладаць ані даніны, ані падатку, ані мыта.
25 А ты, Эзра, паводле мудрасьці Бога твайго, якая ў руцэ тваёй, прызнач урадоўцаў і судзьдзяў,
якія будуць судзіць увесь народ, які ў Зарэччы, усіх, якія ведаюць Закон Бога твайго; і вучыце
тых, якія ня ведаюць.
26 І ўсіх, хто ня будзе выконваць Закон Бога твайго і закон валадара дакладна, тых судзіце на
сьмерць або на выгнаньне, або на кару маёмасьці, або на вязьніцу».
27 Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог бацькоў нашых, Які ўклаў у сэрца валадара, каб аздобіць Дом
ГОСПАДА, які ў Ерусаліме,
28 і ахінуў мяне міласэрнасьцю валадара і дарадцаў ягоных, і ўсіх магутных князёў валадара!
І я ўмацаваўся, бо рука ГОСПАДА, Бога майго, [была] нада мною, і я сабраў з Ізраіля мужоў
галоўных ісьці са мною.

Эзр 8

1 Гэта галовы [дамоў] бацькоў сваіх і радавод тых, што ўзыйшлі са мною з Бабілону ў
валадараньне Артаксэркса валадара:
2 з сыноў Пінхаса — Гершом; з сыноў Ітамара — Даніэль; з сыноў Давіда — Хаттуш;
3 з сыноў Шэханіі, з сыноў Пароша — Захарыя, і з ім запісаных у радаводзе мужчынаў сто
пяцьдзясят;
4 з сыноў Пахат-Маава — Элегаэнай, сын Зэрахіі, і з ім дзьвесьце мужчынаў;
5 з сыноў Шэханіі — сын Яхазіэля, і з ім трыста мужчынаў;
6 з сыноў Адына — Евэд, сын Ёнатана, і з ім пяцьдзясят мужчынаў;
7 з сыноў Эляма — Ешая, сын Аталіі, і з ім семдзясят мужчынаў;
8 з сыноў Шэфатыі — Зэвадыя, сын Міхаэля, і з ім восемдзясят мужчынаў;
9 з сыноў Ёава — Абадыя, сын Ехіэля, і з ім дзьвесьце васямнаццаць мужчынаў;

10 з сыноў [Бані] — Шэляміт, сын Ёсіфіі, і з ім сто шэсьцьдзясят мужчынаў;
11 з сыноў Бэвая — Захарыя, сын Бэвая, і з ім дваццаць восем мужчынаў;
12 з сыноў Азгада — Ёханан, сын Гакатана, і з ім сто дзесяць мужчынаў;
13 з сыноў Аданікама — апошнія, імёны якіх гэткія: Эліфэлет, Еіэль і Шэмая, і з імі
шэсьцьдзясят мужчынаў;
14 з сыноў Бігвая — Утай і Завуд, і з імі семдзясят мужчынаў.
15 І я сабраў іх каля ракі, што ўпадае ў Агаву, і мы стаялі табарам там тры дні; і я агледзеў
народ і сьвятароў, але сыноў Левія там не знайшоў.
16 І паслаў я па Эліэзэра, Арыэля, Шэмаю, Эльнатана, Ярыва, Эльнатана, Натана, Захарыю і
Мэшуляма — галоўных; і па Ёярыва і Эльнатана — кемлівых;
17 І накіраваў іх да Іддо, галоўнага ў мясцовасьці Касіфія, і ўклаў у вусны іхнія словы да Іддо
і братоў ягоных нэтынэяў у мясцовасьці Касіфія, каб яны прывялі нам служыцеляў для Дому
Бога нашага.
18 І прывялі яны да нас, бо добрая рука Божая [была] над намі, мужа разумнага з сыноў Махлі,
сына Левія, сына Ізраіля, і Шэрэвію з сынамі ягонымі, і братоў ягоных — васямнаццаць,
19 і Хашавію, і з ім Ешаю з сыноў Мэрары, братоў ягоных і сыноў ягоных — дваццаць;
20 і з нэтынэяў, якіх даў Давід і князі на служэньне лявітаў, — дзьвесьце дваццаць нэтынэяў,
усе запісаныя па імёнах.
21 І я абвясьціў там пост каля ракі Агавы, каб мы скарыліся перад абліччам Бога нашага і прасілі
ў Яго шляху простага для нас і для дзяцей нашых, і для ўсёй маёмасьці нашай,
22 бо я саромеўся прасіць у валадара войска і коньнікаў, каб абаранялі нас ад ворага ў дарозе,
бо мы сказалі валадару, кажучы: «Рука Бога нашага на дабро для ўсіх, хто шукае Яго, а моц
Ягоная і гнеў Ягоны — на ўсіх, хто пакідае Яго».
23 І мы посьцілі, і прасілі Бога нашага пра гэта; і Ён даў нам упрасіць Сябе.
24 І я аддзяліў дванаццаць князёў над сьвятарамі — Шэрэвію, Хашавію і дзесяць братоў іхніх з
імі,
25 і адважыў ім срэбра, і золата, і начыньне, падараванае для Дому Бога нашага, якое
ахвяравалі валадар і дарадцы ягоныя, і князі ягоныя, і ўвесь Ізраіль, які быў там.
26 І я адважыў на рукі іхнія срэбра шэсьцьсот пяцьдзясят талентаў і начыньня срэбнага — сто
талентаў, і золата — сто талентаў,
27 і келіхаў залатых — дваццаць на тысячу дукатаў, і начыньні з медзі бліскучай, добрай — два,
дарагія як золата.
28 І сказаў я ім: «Вы — сьвятасьць для ГОСПАДА, і начыньні — сьвятасьць, а срэбра і золата —
дабраахвотныя ахвяры для ГОСПАДА, Бога бацькоў вашых.
29 Чувайце і пільнуйце [гэта], аж пакуль адважыце [яго] перад князямі сьвятароў і лявітаў і
перад князямі [дамоў] бацькоў Ізраіля ў Ерусаліме, у пакоях Дому ГОСПАДА».
30 І ўзялі сьвятары і лявіты вагу срэбра і золата, і начыньні, каб прынесьці ў Ерусалім, у Дом
Бога нашага.
31 І вырушылі мы ад ракі Агавы ў дванаццаты дзень першага месяца, каб ісьці ў Ерусалім. І
рука Бога нашага была над намі, і ўратавала нас ад рукі ворага і ад засады на шляху.
32 І прыйшлі мы ў Ерусалім, і былі там тры дні.
33 У чацьвёрты дзень адважылі мы срэбра і золата, і начыньне ў Доме Бога нашага на руку
Мэрэмота, сына Урыі, сьвятара, а з ім [быў] Элеазар, сын Пінхаса, і з імі — Ёзавад, сын Ешуа, і
Наадыя, сын Біннуя, лявіты,
34 усё лікам і вагою. І запісана была ўся тая вага ў той самы час.
35 Тыя, што прыйшлі з палону, сыны выгнаньня, склалі цэласпаленьне для Бога Ізраіля —
дванаццаць бычкоў за ўсяго Ізраіля, дзевяноста шэсьць бараноў, семдзясят сем ягнятаў і
дванаццаць казлоў у ахвяру за грэх, усё на цэласпаленьне для ГОСПАДА.
36 І яны аддалі загады валадара цівунам валадарскім і ваяводам Зарэчча, і яны дапамагалі
народу і Дому Божаму.

Эзр 9

1 А калі скончыліся гэтыя [справы], падыйшлі да мяне князі, кажучы: «Не аддзяліўся народ
Ізраіля, і сьвятары, і лявіты ад народаў зямлі гэтай і агідаў іхніх, ад Хананейцаў, Хетаў,
Пэрэзэяў, Евусэяў, Аманянаў, Мааўлянаў, Эгіпцянаў і Амарэйцаў,
2 бо яны пабралі сабе і сынам сваім дочак іхніх, і зьмяшалася насеньне сьвятое з народамі
зямлі гэтай, і рука князёў і кіраўнікоў была першай у здрадзе гэтай ».
3 І калі я пачуў гэтае слова, разадраў адзеньне маё і плашч мой, і рваў валасы з галавы маёй і
з барады маёй, і сядзеў збалелы.
4 І сабраліся да мяне ўсе, якія трымцяць перад словамі Бога Ізраіля, з прычыны здрады тых,
што прыйшлі з выгнаньня; а я сядзеў збалелы аж да ахвяры вячэрняй.
5 І [ў часе] ахвяры вячэрняй я ўстаў з немарасьці маёй, і разадраўшы адзеньне маё і плашч
мой, схіліўся на калені мае і выцягнуў рукі мае да ГОСПАДА, Бога майго,
6 і сказаў: «Божа мой! Я ў сораме і ганьбе, каб узьняць, Божа мой, аблічча маё да Цябе, бо
беззаконьні нашыя памножыліся вышэй галавы, і правіны нашыя вырасьлі аж да неба.
7 Ад дзён бацькоў нашых аж да дня гэтага мы ў вялікай правіне; і за беззаконьні нашыя мы,
валадары нашыя, сьвятары нашыя аддадзеныя ў руку валадароў земляў [гэтых] пад меч, у
палон, на рабаваньне і на асаромленьне аблічча, як у дзень гэты.
8 І цяпер на хвіліну сталася нам ласка ад ГОСПАДА, Бога нашага, каб пакінуць нам рэшту і даць
нам [паставіць] калок у месцы сьвятасьці Ягонай, каб асьвяціў вочы нашыя Бог наш і даў нам
крыху ажыць у няволі нашай.
9 Бо мы — нявольнікі; але і ў няволі нашай не пакінуў нас Бог наш. І Ён прыхіліў да
нас міласэрнасць валадароў Пэрсаў, каб яны далі нам ажыць, узьняць Дом Бога нашага, і
адбудаваць руіны ягоныя, і даць нам агароджу ў Юдэі і ў Ерусаліме.
10 І цяпер, Божа наш, што скажам мы пасьля гэтага? Бо мы пакінулі прыказаньні Твае,
11 якія Ты загадаў праз слугаў Тваіх прарокаў, кажучы: “Зямля, у якую вы ідзіцё, каб узяць у
спадчыну — зямля нячыстая праз нячыстасьць народаў зямлі гэтай, праз брыдоты іхнія, якімі
напоўнілі яе ад краю да краю ў нячыстасьці сваёй.
12 І цяпер дачок сваіх не аддавайце за сыноў іхніх, і дачок іхніх не бярыце для сыноў сваіх, і не
шукайце супакою іхняга і дабра іхняга на вякі, каб умацавацца вам і спажываць дабро зямлі, і
пакінуць яе ў спадчыну сынам вашым на вякі”.
13 І пасьля ўсяго, што прыйшло на нас за ўчынкі ліхія нашыя і за правіны вялікія нашыя, — бо
Ты, Божа наш, пакараў нас менш, чым беззаконьні нашыя, і даў нам [захаваць] рэшту, —
14 няўжо мы будзем ізноў парушаць прыказаньні Твае і сваячыцца з народамі брыдотаў гэтых?
Ці не загневаешся Ты на нас аж да выгубленьня, так што ня будзе ані рэшты, ані ўратаванага?
15 ГОСПАДЗЕ, Божа Ізраіля! Ты — праведны, бо мы засталіся як рэшта ў дзень гэты; і вось, мы
ў правінах нашых перад абліччам Тваім, хоць не належыць нам стаяць перад абліччам Тваім
за ўсё гэта».

Эзр 10

1 І калі Эзра маліўся і спавядаўся, плачучы і падаючы перад Домам Божым, сабралася да яго
з усяго Ізраіля вельмі вялікая царква мужчынаў, жанчынаў і дзяцей, бо народ плакаў плачам
вялікім.
2 І адказаў Шэханія, сын Ехіэля, з сыноў Эляма, і сказаў Эзры: «Мы сталіся нявернымі Богу
нашаму і пабралі жонак чужынак з народаў зямлі гэтай, але цяпер ёсьць яшчэ надзея ў Ізраіля.
3 І цяпер заключым запавет з Богам нашым, што выправім усіх жонак і народжаных ад іх,
паводле рады гаспадара майго і тых, якія трымцяць перад прыказаньнем Бога нашага, і няхай
будзе паводле Закону!
4 Устань, бо на табе справа гэтая, і мы з табою. Будзь мужны і рабі!»
5 І ўстаў Эзра, і запрысяг князёў, сьвятароў і лявітаў, і ўсяго Ізраіля, што зробяць паводле слова
гэтага; і яны прысягнулі.

6 І ўстаў Эзра спрад Дому Божага, і пайшоў у пакой Егаханана, сына Эліяшыва, і прыйшоў туды.
Хлеба ён ня еў і вады ня піў, бо ён быў у жалобе з прычыны здрады тых, што вярнуліся з палону.
7 І абвясьцілі гучна ў Юдэі і ў Ерусаліме ўсім сынам выгнаньня, каб яны сабраліся ў Ерусалім.
8 І ў кожнага, хто ня прыйдзе за тры дні, паводле рады князёў і старшыняў, уся маёмасьць
ягоная будзе пад закляцьцем, а сам ён будзе адлучаны ад царквы тых, што вярнуліся з палону.
9 І сабраліся ўсе мужчыны Юды і Бэн'яміна за тры дні ў Ерусалім. Гэта [быў] дзявяты месяц,
дваццаты дзень месяца. І ўвесь народ сядзеў на панадворку Дому Божага, дрыжучы з прычыны
справы гэтай і ад дажджу.
10 І ўстаў Эзра сьвятар, і сказаў ім: «Вы сталіся нявернымі і ўзялі за жонак чужынак, каб
павялічыць правіну Ізраіля.
11 І цяпер прынясіце падзяку ГОСПАДУ, Богу бацькоў вашых, і ўчыніце волю Ягоную, і
аддзяліцеся ад народаў зямлі гэтай і ад жанчынаў чужынскіх».
12 І адказала ўся царква, і сказалі голасам вялікім: «Паводле слова Твайго мы так зробім!
13 Але народ шматлікі і час дажджоў, і няма сілы стаяць звонку. І гэтая праца не аднаго дня, і
ня двух, бо шмат саграшылі мы ў справе гэтай.
14 Няхай князі нашыя стаяць за ўсю царкву, і няхай усе ў гарадах нашых, якія ўзялі жонак
чужынскіх, прыйдуць у вызначаны час, і з імі старшыні кожнага гораду і судзьдзі ягоныя, аж
пакуль не адвернецца ад нас ярасьць гневу Бога нашага за справу гэтую».
15 Толькі Ёнатан, сын Асагэля, і Яхзэя, сын Тыквы, паўсталі супраць гэтага, а Мэшулям і
Шабэтай, лявіты, дапамагалі ім.
16 І зрабілі гэтак сыны выгнаньня. І аддзяліў Эзра сьвятар некаторых людзей, галоваў [дамоў]
бацькоў, паводле дамоў бацькоў іхніх, усіх па імёнах. І яны селі ў першы дзень дзясятага
месяца дасьледаваць справу гэтую,
17 і скончылі да першага дня першага месяца з усімі мужчынамі, якія ўзялі жонак чужынскіх.
18 І былі знойдзены з сыноў сьвятарскіх, якія ўзялі за жонак чужынак, — з сыноў Ешуа, сына
Ёцадака і братоў ягоных: Маасэя, Эліэзэр, Ярыў і Гедалія.
19 І яны далі руку сваю, што выправяць [ад сябе] жонак сваіх, і вінаватыя [ахвяруюць] барана
са статку за правіну сваю.
20 А з сыноў Іммэра: Ханані і Зэвадыя.
21 З сыноў Харыма: Маасэя, Элія, Шэмая, Ехіэль і Узія.
22 З сыноў Пашхура: Эліаэнай, Маасэя, Ішмаэль, Натанаэль, Ёзавад і Эляса.
23 З лявітаў: Ёзавад, Шымэй і Келая, ён жа Келіта, Пэтахія, Юда і Эліэзэр.
24 Са сьпевакоў: Эліяшыў; а з прыдзьвернікаў: Шальлюм, Тэлем і Уры.
25 А з Ізраіля, з сыноў Пароша: Рамія, Іззія, Малькія, Міямін, Элеазар, Малькія і Бэная.
26 З сыноў Эляма: Маттанія, Захарыя, Ехіэль, Аўды, Ерэмот і Элія.
27 З сыноў Затту: Эліаэнай, Эліяшыў, Маттанія, Ерэмот, Завад і Азіза.
28 З сыноў Бэвая: Егаханан, Хананія, Заббай і Атлай.
29 З сыноў Бані: Мэшулям, Малух, Адая, Яшуў, Шэал і Ерэмот.
30 З сыноў Пахат-Маава: Адна, Хелал, Бэная, Маасэя, Маттанія, Бэцаліэль, Біннуй і Манаса.
31 З сыноў Харыма: Эліэзэр, Ішыя, Малхія, Шэмая, Сымон,
32 Бэн'ямін, Малух, Шэмарыя.
33 З сыноў Хашума: Маттэнай, Матата, Завад, Эліфэлет, Ерэмай, Манаса, Шымэй.
34 З сыноў Бані: Маадай, Амрам, Уіэль,
35 Бэная, Бэдэя, Келуху,
36 Ванія, Мэрэмот, Эліяшыў,
37 Маттанія, Маттэнай, Яасай,
38 Бані, Біннуй, Шымэй,
39 Шэлемія, Натан, Адая,
40 Махнадэвай, Шашай, Шарай,
41 Азарэль, Шэлемія, Шэмарыя,
42 Шальлюм, Амарыя, Язэп.

43 З сыноў Нэво: Еіэль, Маттытыя, Завад, Зэвіна, Яддай, Ёэль, Бэная.
44 Усе гэтыя ўзялі жонак чужынскіх, і [некаторыя] з гэтых жанчынаў нарадзілі сыноў.

КНІГА НЭЭМІІ

1 Словы Нээміі, сына Хакаліі. І сталася ў месяцы Кісьлеў у дваццатым годзе, і быў я ў Шушане,
сталіцы.
2 І прыйшоў Ханані, адзін з братоў маіх, ён і мужы з Юдэі. І я спытаўся ў іх пра Юдэяў, што
[там] засталіся, якія ўцяклі ад палону, і пра Ерусалім.
3 І яны сказалі мне: «Тыя, што засталіся, якія ўцяклі ад палону там, у краіне, у вялікім горы і
ганьбе; мур Ерусаліму разбураны, і брамы ягоныя спаленыя агнём».
4 І сталася, калі я пачуў словы гэтыя, я сеў, і плакаў, і быў у жалобе [некалькі дзён], і посьціў,
і маліўся перад абліччам Бога нябеснага.
5 І я сказаў: «Прашу Цябе, ГОСПАДЗЕ, Божа нябесны, Бог вялікі і страшны, Які захоўвае запавет
і міласэрнасьць для тых, якія любяць Цябе і захоўваюць прыказаньні Твае!
6 Няхай будзе вуха Тваё ўважлівае і вочы Твае адкрытыя, каб пачуць малітву слугі Твайго, якой
я малюся перад абліччам Тваім сёньня дзень і ноч за сыноў Ізраіля, слугаў Тваіх, і прызнаюся
ў грахах сыноў Ізраіля, якімі мы грашылі супраць Цябе, і я, і дом бацькі майго грашылі.
7 Робячы злачынства, мы сталіся злачынцамі супраць Цябе і не захоўвалі прыказаньні, і
пастановы, і прысуды, якія Ты загадаў Майсею, слузе Твайму.
8 Узгадай, калі ласка, слова, якое Ты загадаў Майсею, слузе Твайму, кажучы: “Калі будзеце
нявернымі, Я расьцярушу вас паміж народамі.
9 Але калі вернецеся да Мяне і будзеце захоўваць прыказаньні Мае і выконваць іх, хоць бы вы
былі выгнаныя на канцы неба, і адтуль Я зьбяру вас, і, прыводзячы, прывяду вас на месца, якое
Я выбраў, каб жыло там імя Маё!”
10 Яны ж — слугі Твае і народ Твой, які Ты адкупіў моцаю Тваёю вялікай і рукою Тваёю
магутнай.
11 Прашу Цябе, Госпадзе, няхай будзе вуха Тваё ўважлівае да малітвы слугі Твайго і да малітваў
слугаў Тваіх, якія баяцца імя Твайго. І дай посьпех, прашу, слузе Твайму сёньня, і даруй яму
мець ласку перад абліччам чалавека гэтага». А я быў падчашым валадара.

Нээм 2

1 І сталася ў месяцы Нісан, у дваццатым годзе валадара Артарксэркса, віно было перад
абліччам ягоным. І я падняў віно, і даў валадару; і ня быў я смутны перад абліччам ягоным.
2 І сказаў мне валадар: «Чаму аблічча Тваё смутнае, а ты ня хворы? Гэта нішто іншае, як смутак
сэрца». Я спалохаўся вельмі моцна,
3 і сказаў валадару: «Няхай жыве валадар на вякі! Як ня будзе смутным аблічча маё, калі
горад, дом магілаў бацькоў маіх, спустошаны, і брамы ягоныя спаленыя агнём!»
4 І сказаў мне валадар: «Пра што просіш?» Я памаліўся Богу нябеснаму,
5 і сказаў валадару: «Калі [падаецца] добрым валадару, і слуга твой знайшоў ласку перад
абліччам тваім, пашлі мяне ў Юдэю, у горад магілаў бацькоў маіх, і я адбудую яго».
6 І сказаў мне валадар, а валадарка сядзела каля яго: «Як доўга ты будзеш у дарозе? І калі
вернешся?» І гэта было добрым перад абліччам валадара, і ён паслаў мяне, і я вызначыў яму
час.
7 І я сказаў валадару: «Калі [падаецца] добрым валадару, няхай дадуць мне лісты да ваяводаў
Зарэчча, каб прапусьцілі мяне, пакуль я дайду да Юдэі,
8 і ліст да Асафа, загадчыка лясоў валадара, каб ён даў мне дрэва для бэлькаў брамаў гораду,
у якім Дом [Божы], і для муроў гораду, і на дом, у які я ўвайду». І даў мне валадар, бо добрая
рука Бога майго [была] нада мною.
9 І я прыйшоў да ваяводаў Зарэчча, і даў ім лісты валадара. І паслаў валадар са мною
начальнікаў войска і вершнікаў.
10 І пачуў Санвалат Харанянін і Товія, слуга Аманянін, і ім было вельмі прыкра, што прыйшоў
чалавек, каб шукаць дабра для сыноў Ізраіля.

11 І я прыйшоў у Ерусалім, і быў там тры дні.
12 І я ўстаў уначы, і некалькі чалавек са мною, і я нікому не сказаў, што Бог мой даў мне на
сэрца зрабіць для Ерусаліму. А жывёлы не было са мною ніякай, акрамя той жывёлы, на якой
я ехаў.
13 І я прыехаў уначы праз Браму Даліны перад крыніцай Цмокаў да Брамы Гною; і агледзеў я
муры Ерусаліму, якія былі зруйнаваныя, і брамы ягоныя, якія спаленыя агнём.
14 І я прайшоў да Брамы Крыніцы і да сажалкі валадарскай; і не было месца прайсьці жывёле,
[якая была] пада мною.
15 І я ўзьняўся ўначы ўздоўж ручая, і агледзеў мур, і вярнуўся, і ўвайшоў праз Браму Даліны, і
вярнуўся.
16 А кіраўнікі [народу] ня ведалі, куды я хадзіў і што рабіў. Ані Юдэям, ані сьвятарам, ані
шляхце, ані кіраўнікам, ані іншым, якія выконвалі працу, я не распавядаў [нічога] аж да гэтай
пары.
17 І я сказаў ім: «Вы бачыце гора, у якім мы [знаходзімся], што Ерусалім зруйнаваны і брамы
ягоныя спаленыя агнём. Хадзем і адбудуем муры Ерусаліму, і ня будзем больш у ганьбе».
18 І я распавёў ім пра руку Бога майго, якая была добрай да мяне, а таксама пра словы валадара,
якія ён казаў мне. І яны сказалі: «Станем і будзем будаваць». І ўмацавалі рукі свае на добрую
[справу].
19 І пачулі Санвалат Харанянін, і Товія, слуга Аманянін, і Гешэм Араб, і сьмяяліся з нас, і
грэбавалі намі, і казалі: «Што гэта за справа, якую вы робіце? Ці не бунтуецеся вы супраць
валадара?»
20 І я даў ім адказ, і сказаў ім: «Бог нябесны, Ён [Сам] дасьць нам посьпех, і мы, слугі
Ягоныя, устанем і будзем будаваць. А для вас няма ані часткі, ані праведнасьці, ані памяці
ў Ерусаліме».

Нээм 3

1 І ўстаў Эліяшыў, вялікі сьвятар, і браты ягоныя, сьвятары, і адбудавалі Браму Авечак. Яны
асьвяцілі яе і паставілі вароты ў яе; аж да вежы Мэа асьвяцілі яе, аж да вежы Хананэля.
2 А каля яго будавалі Ерыхонцы, а каля іх будаваў Заккур, сын Імры.
3 А Браму Рыбную будавалі сыны Гасэнаі, якія палажылі бэлькі ў яе і паставілі вароты яе, замкі
яе і завалы яе.
4 А каля іх адбудоўваў Мэрэмот, сын Урыі, сына Гаккоца; а каля іх адбудоўваў Мэшулям, сын
Бэрэхі, сына Мэшэзабэля; каля іх адбудоўваў Цадок, сын Бааны.
5 А каля іх адбудоўвалі Тэкойцы; але магнаты іхнія не схілілі шыі свае ў працы для ГОСПАДА
свайго.
6 А Старую Браму адбудоўвалі Ёяда, сын Пасэаха, і Мэшулям, сын Бэсодыі; яны палажылі
бэлькі ў яе, паставілі вароты яе, і замкі яе, і завалы яе.
7 А каля іх адбудоўвалі Мэлатыя з Гібэону і Ядон з Мэраноту, людзі з Гібэону і Міцпы, сядзібы
ваяводы Зарэчча.
8 Каля яго адбудоўваў Узіэль, сын Харгая, з залатароў; а каля яго адбудоўваў Ханані, сын
зельніка. Яны аднавілі [муры] Ерусаліму аж да муру шырокага.
9 А каля іх адбудоваў Рэфая, сын Хура, начальнік паловы акругі Ерусаліму.
10 А каля іх, насупраць дому свайго, адбудоўваў Едая, сын Харумафа; а каля яго адбудоўваў
Хаттуш, сын Хашаўнэя.
11 Другі адцінак адбудоўвалі Малхія, сын Харыма, і Хашуў, сын Пахат-Маава, [яны
адбудоўвалі] таксама Вежу Печаў.
12 А каля іх адбудоўваў Шальлюм, сын Галяхеша, начальнік паловы акругі Ерусаліму, ён і дочкі
ягоныя.
13 А Браму Даліны адбудоўвалі Ханун і жыхары Занааха; яны пабудавалі яе і паставілі вароты
яе, замкі яе і завалы яе; і [направілі яны] тысячу локцяў муру аж да Брамы Гною.
14 А Браму Гною адбудоўваў Малкія, сын Рэхава, начальнік акругі Бэт-Гакерэм; ён пабудаваў
яе і паставіў вароты яе, замкі яе і завалы яе.

15 А Браму Крыніцы адбудоўваў Шальлюм, сын Каль-Хазэя, начальнік акругі Міцпы; ён
пабудаваў яе, і накрыў яе, і паставіў вароты яе, замкі яе і завалы яе; і [адбудаваў] мур сажалкі
Шэлях каля саду валадара і аж да прыступак, якія зыходзяць з гораду Давіда.
16 За ім адбудоўваў Нээмія, сын Азбука, начальнік паловы акругі Бэт-Цур, аж да [месца]
насупраць магілаў Давідавых і аж да выкапанай сажалкі, аж да дому ваяроў.
17 За ім адбудоўвалі лявіты: Рэхум, сын Бані; каля яго адбудоўваў Хашавія, начальнік паловы
акругі Кейла, за акругу сваю.
18 За ім адбудоўвалі браты іхнія: Баўвай, сын Хенадада, начальнік паловы акругі Кейла.
19 А каля яго Езэр, сын Ешуа, начальнік Міцпы, адбудоўваў другі адцінак, насупраць уваходу ў
збраёўню на рагу.
20 За ім Барух, сын Заббая, рупліва адбудоўваў іншы адцінак, ад рогу аж да дзьвярэй дому
Эліяшыва, вялікага сьвятара.
21 За ім Мэрэмот, сын Урыі, сына Гаккоца, адбудоўваў іншы адцінак, ад дзьвярэй дому
Эліяшыва аж да канца дому Эліяшыва.
22 За ім адбудоўвалі сьвятары, людзі з ваколіцы.
23 За імі адбудоўваў Бэн'ямін і Хашуў насупраць дому свайго; за імі адбудоўваў Азарыя, сын
Маасэі, сына Ананіі, каля дому свайго.
24 За ім адбудоўваў Біннуй, сын Хэнадада, іншы адцінак, ад дому Азарыі аж да рогу і вугла.
25 Палал, сын Узая, [адбудоўваў] насупраць рогу і вежы, якая выстае з верхняга дому
валадарскага і якая ў панадворку варты. За ім [адбудоўваў] Пэдая, сын Пароша.
26 А нэтынэі, якія жылі ў Афэле, [адбудоўвалі] насупраць Брамы Воднай на ўсход і аж да
высунутай вежы.
27 За імі Тэкойцы, адбудоўвалі другі адцінак, ад [месца] насупраць вялікай высунутай вежы
аж да муру Афэла.
28 Вышэй Брамы Конскай адбудоўвалі сьвятары, кожны насупраць дому свайго.
29 За імі адбудоўваў Цадок, сын Іммэра, насупраць дому свайго; а за ім адбудоўваў Шэмая, сын
Шэхніі, вартаўнік Брамы Усходняй.
30 За ім адбудоўваў Хананія, сын Шэлеміі, і Ханун, шосты сын Цалафа, другі адцінак. За ім
адбудоўваў Мэшулям, сын Бэрэхіі, насупраць пакою свайго.
31 За ім адбудоўваў Малхія, сын залатара, аж да дому нэтынэяў і гандляроў, насупраць Брамы
Міфкад і аж да кутняй сьвятліцы.
32 А паміж кутняй сьвятліцай і Брамай Авечак адбудоўвалі залатары і гандляры.

Нээм 4

1 І сталася, калі пачуў Санвалат, што мы будуем мур, ён раззлаваўся, і вельмі загневаўся, і
сьмяяўся з Юдэяў,
2 і казаў пры братах сваіх і пры войску Самаранскім, і сказаў: «Што робяць гэтыя нікчэмныя
Юдэі? Няўжо ім гэта дазволяць? Няўжо яны будуць складаць ахвяры? Няўжо яны скончаць у
[нейкі] дзень? Няўжо яны ажывяць камяні з купаў друзу, якія спаленыя [агнём]?»
3 І Товія Аманянін быў каля яго, і сказаў: «Няхай яны будуюць. Калі ўвойдзе ліс, разваліць іхні
мур каменны».
4 Пачуй, Божа наш, бо мы сталіся насьмешкай. І зьвярні ганьбаваньне іхняе на галаву іхнюю,
і аддай іх на рабаваньне ў зямлі паланеньня,
5 і не закрый беззаконьня іхняга, і грэх іхні няхай ня будзе выцерты перад абліччам Тваім, бо
яны зьняважылі [Цябе] перад тымі, што будуюць.
6 І мы будавалі мур, і ўвесь мур быў напраўлены да паловы яго. І народ меў сэрца да работы.
7 І сталася, калі пачуў Санвалат, і Товія, і Арабы, і Аманяне, і Ашдодцы, што адбудоўваюцца
муры Ерусаліму і што выломы пачалі зарабляць, яны вельмі загневаліся.
8 І яны змовіліся ўсе разам пайсьці вайною на Ерусалім і зрабіць нам перашкоду [ў працы].
9 І мы маліліся Богу нашаму, і паставілі супраць іх варту ўдзень і ўначы з прычыны [намеру]
іхняга.
10 І сказалі Юдэі: «Спатыкаецца сіла ў тых, што носяць цяжары; і мы ня зможам будаваць мур».

11 І сказалі прыгнятальнікі нашыя: «Не даведаюцца і ня ўбачаць, калі мы ўвойдзем у сярэдзіну
іх, і пераб'ем іх, і спынім працу».
12 І сталася, што прыйшлі Юдэі, якія жылі каля іх, і казалі нам разоў дзесяць з усіх бакоў, што
яны прыйдуць на нас.
13 І ў нізкіх месцах, за мурам, на месцах голых я паставіў людзей паводле сем'яў іхніх з мячамі
іхнімі, з дзідамі іхнімі і з лукамі іхнімі.
14 І я агледзеў [іх], і стаў, і сказаў шляхце і кіраўнікам, і рэшце народу: «Ня бойцеся іх.
Памятайце пра Госпада вялікага і страшнага, і змагайцеся за братоў сваіх, за сыноў сваіх і за
дочак сваіх, за жонак сваіх і за дамы свае».
15 І сталася, калі пачулі ворагі нашыя, што [гэта] нам вядома, Бог зьнішчыў намер іхні, і мы
вярнуліся ўсе да муру, кожны да працы сваёй.
16 І сталася ад гэтага дня, што палова юнакоў маіх рабіла, а [другая] палова іх трымала дзіды,
шчыты, лукі і панцыры; і князі [стаялі] за ўсім домам Юды.
17 Тыя, што будавалі мур, і тыя, што насілі цяжары, і тыя, што працавалі, [кожны] адною рукою
сваёй рабіў [мур], а ў другой [руцэ] трымаў зброю.
18 І кожны будаўнік быў падперазаны мячом па сьцёгнах сваіх, і [так] будаваў. І той, што дзьме
ў рог, [быў] пры мне.
19 І я сказаў шляхце і кіраўнікам, і рэшце народу: «Праца вялікая і разнастайная, і мы
падзеленыя на муры, далёкія адзін ад аднаго.
20 У якім месцы вы пачуеце гук рогу, туды зьбірайцеся да нас. Бог наш будзе ваяваць за нас».
21 І гэтак мы рабілі працу; і палова з іх трымала дзіды ад сьвітаньня аж да зьяўленьня зорак.
22 Таксама ў той час я сказаў народу, каб кожны з юнаком сваім начаваў у сярэдзіне Ерусаліму,
і былі яны ў нас уначы вартаю, а ўдзень — на працы.
23 І ані я, ані браты мае, ані юнакі мае, ані вартаўнікі, якія [былі] са мною, ніхто з нас не здымаў
адзеньняў сваіх, кожны [быў] са зброяй і з вадою.

Нээм 5

1 І быў вялікі крык народу і жонак іхніх на братоў сваіх Юдэяў.
2 І былі [тыя], якія казалі: «Нас, сыноў нашых і дочак нашых шмат; і мы мусім браць збожжа,
каб есьці і жыць».
3 І былі тыя, якія казалі: «Палі свае, вінаграднікі свае і дамы свае мы закладаем, каб купіць
збожжа ў часе голаду».
4 І былі тыя, якія казалі: «Мы бяром у пазыку на падаткі валадару, [даўшы ў заклад] палі нашыя
і вінаграднікі нашыя.
5 І цяпер, целы нашыя такія, як целы братоў нашых, і сыны нашыя такія, як сыны іхнія;
а вось, мы мусім аддаваць у няволю сыноў сваіх і дачок сваіх, і некаторыя з дачок нашых
зьняволеныя; і мы ня маем сілы ў руках нашых, бо палі нашыя і вінаграднікі нашыя — у іншых
[людзей]».
6 І я моцна загневаўся, калі пачуў крык іхні і словы гэтыя.
7 І дало раду ў-ва мне сэрца маё, і я спрачаўся са шляхтай і кіраўнікамі, і сказаў ім: «Вы бярэце
вялікі адсотак кожны з брата свайго». І я сабраў вялікую грамаду супраць іх,
8 і сказаў ім: «Мы паводле магчымасьцяў нашых выкупляем братоў нашых, Юдэяў, якія
прададзены паганам, а вы прадаяцё братоў вашых, і яны прадаваныя вам». І яны маўчалі, і
не знаходзілі слова, [каб адказаць].
9 І я сказаў: «Нядобрая рэч, якую вы робіце. Ці ж ня ў страху Бога нашага павінны вы хадзіць,
каб пазьбегнуць ганьбаваньня ад паганаў, ворагаў нашых?
10 І таксама я, браты мае і юнакі мае пазычалі для іх срэбра і збожжа. Даруйма, прашу, адсоткі
гэтыя!
11 Вярніце ім, прашу, яшчэ сёньня палі іхнія, аліўнікі іхнія і дамы іхнія, і таксама адсоткі за
срэбра і збожжа, віно і алей, якія вы ўзялі ад іх».
12 І яны сказалі: «Вернем і ня будзем ад іх вымагаць; зробім так, як ты кажаш». І я паклікаў
сьвятароў, і запрысягнуў іх, што яны так зробяць.

13 Таксама заўлоньне сваё я вытрас і сказаў: «Гэтак няхай вытрасе Бог кожнага чалавека, які
ня будзе стаяць пры слове гэтым, з дому ягонага і з таго, што належыць яму, і гэтак няхай ён
будзе вытрасены і пусты!» І сказала ўся царква: «Амэн!», і ўславілі ГОСПАДА. І зрабіў народ
паводле слова гэтага.
14 Таксама ад дня, калі [валадар] загадаў мне быць ваяводам іхнім у зямлі Юды, ад дваццатага
году да трыццаць другога году валадара Артарксэркса, дванаццаць гадоў, я і браты мае ня елі
хлеба ваяводы.
15 А ранейшыя ваяводы, якія былі да мяне, абцяжарвалі народ і бралі з яго хлеб і віно, і яшчэ
сорак сыкляў срэбра. Таксама юнакі іхнія панавалі над народам. А я так не рабіў дзеля страху
Божага.
16 І таксама я працаваў, адбудоўваючы мур гэты; і палёў мы не куплялі; і ўсе юнакі мае
зьбіраліся там на працу.
17 І Юдэі, і кіраўнікоў сто пяцьдзясят чалавек, і тыя, што прыходзілі да нас з народаў, якія вакол
нас, [былі] за сталом маім.
18 І вось тое, што было гатавана на адзін дзень: аднаго вала, шэсьць выборных авечак і [шмат]
птушак гатавалі ў мяне; і за дзесяць дзён шмат выходзіла ўсялякага віна. І пры гэтым хлеба
ваяводы я не патрабаваў, бо цяжкая [была] праца народу гэтага.
19 Памятай пра мяне, Божа мой, на дабро мне, пра ўсё, што я зрабіў для народу гэтага!

Нээм 6

1 І сталася, што пачуў Санвалат, і Товія, і Гешэм Араб, і іншыя ворагі нашыя, што я адбудаваў
мур, і што не засталося выломаў у ім, хоць да гэтага часу я не паставіў вароты ў брамы.
2 І паслаў Санвалат і Гешэм да мяне, кажучы: «Прыходзь, сустрэнемся разам у Кэферыме ў
даліне Она». А яны надумалі зрабіць мне зло.
3 І я паслаў да іх пасланцоў, кажучы: «Я раблю вялікую працу і не магу зыйсьці, каб не
прыпынялася праца, калі я пакінуў яе і зыйду да вас».
4 І прысылалі да мяне гэткім парадкам чатыры разы, і я адказваў ім такім самым парадкам.
5 І паслаў да мяне Санвалат гэткім парадкам у пяты раз юнака свайго, і ліст адкрыты ў руцэ
ягонай.
6 Было напісана ў ім: «Паміж народамі чутно, і Гашму кажа, што ты і Юдэі надумалі
збунтавацца. Дзеля гэтага ты будуеш мур, і ты надумаў стаць валадаром іхнім, паводле словаў
тых.
7 І таксама ты паставіў прарокаў, каб абвяшчалі пра цябе ў Ерусаліме, кажучы: “Валадар
[ёсьць] у Юдэі”. І цяпер пачуе валадар словы гэтыя. Дык цяпер прыйдзі, і параімся разам».
8 І я паслаў да яго, кажучы: «Нічога не было паводле словаў тых, як ты кажаш, але ты выдумаў
гэта ў сэрцы тваім».
9 Бо ўсе страшылі нас, кажучы: «Саслабеюць рукі іхнія ад працы, і яна ня будзе скончана». Але
цяпер я [тым больш] умацаваў рукі мае!
10 І прыйшоў я ў дом Шэмаі, сына Дэлаі, сына Мэгэтавэля, і ён замкнуўся, і сказаў:
«Сустрэнемся ў Доме Божым, унутры сьвятыні, і замкнем дзьверы сьвятыні, бо прыйдуць,
каб забіць цябе. Уначы прыйдуць, каб забіць цябе».
11 І я сказаў: «Ці такі чалавек, як я, можа ўцякаць? І хто, такі як я, можа ўвайсьці ў сьвятыню і
застацца жывы? Не пайду».
12 І я даведаўся, і вось, ня Бог паслаў яго, хоць ён прамовіў прароцтва мне, але Товія і Санвалат
нанялі яго.
13 Дзеля таго ён быў наняты, каб я спалохаўся, і зрабіў так, і саграшыў, і яны мелі б благую
вестку [пра мяне], каб зьневажаць мяне.
14 Узгадай, Божа мой, Товію і Санвалата паводле ўчынкаў іхніх, і таксама прарочыцу Наадыю
і іншых прарокаў, якія хацелі напалохаць мяне!
15 І быў скончаны мур у дваццаць пяты дзень месяца Элюла, за пяцьдзясят два дні.

16 І сталася, калі пачулі [пра гэта] ўсе ворагі нашыя, і ўбачылі [гэта] ўсе народы, якія вакол
нас, яны былі моцна паніжаныя ў вачах сваіх і даведаліся, што Богам нашым была зробленая
праца гэтая.
17 І таксама ў тыя дні множыла шляхта Юдэі лісты свае, якія пасылалі Товіі, і ад Товіі [лісты]
прыходзілі да іх,
18 бо мноства ў Юдэі было зьвязана прысягаю з ім, бо ён [быў] зяць Шэханіі, і Ёгаханан, сын
ягоны, узяў дачку Мэшуляма, сына Бэрэхіі.
19 Таксама пра добрыя ўчынкі ягоныя расказвалі перада мною, а словы мае перадавалі яму. І
Товія пасылаў лісты, каб напалохаць мяне.

Нээм 7

1 І сталася, калі мур быў пабудаваны, і я паставіў вароты, і былі прызначаныя прыдзьвернікі,
і сьпевакі, і лявіты,
2 я прызначыў Ханані, брата майго, і Хананію, начальніка сталіцы, над Ерусалімам, бо ён быў
чалавек праўдзівы і баяўся Бога [больш], чым шмат хто.
3 І я, кажучы, сказаў ім: «Няхай ня будуць адчыненыя брамы Ерусаліму, пакуль не прыпячэ
сонца; і пакуль [людзі] стаяць [на нагах], няхай зачыняюць вароты і замыкаюць. І прызначце
варту з жыхароў Ерусаліму, кожнага на варту ягоную і кожнага насупраць дому ягонага».
4 Але горад займаў абшар і быў вялікі, а народу [было] мала ў ім, і не было дамоў адбудаваных.
5 І палажыў мне Бог у сэрцы маім, і я сабраў шляхту, кіраўнікоў і народ, каб зрабіць попіс. І я
знайшоў кнігу попісу тых, якія прыйшлі напачатку, і знайшоў, што напісана ў ёй:
6 «Гэта сыны зямлі гэтай, якія прыйшлі з палону выгнаньня, якіх перасяліў Навухаданосар,
валадар Бабілонскі, і яны вярнуліся ў Ерусалім і Юдэю, кожны ў горад свой.
7 Яны прыйшлі з Зэрубабэлем, Ешуам, Нээіміем, Азарыем, Рааміем, Нахаманіем, Мардэхаем,
Більшанам, Міспэрэтам, Бігваем, Нэхумам, Баанаю. [Вось] лік мужчынаў народу Ізраіля:
8 сыноў Пароша — дзьве тысячы сто семдзясят два;
9 сыноў Шэфатыі — трыста семдзясят два;
10 сыноў Араха — шэсьцьсот пяцьдзясят два;
11 сыноў Пахат-Маава, з сыноў Ешуа і Ёава, — дзьве тысячы васемсот васямнаццаць;
12 сыноў Эляма — тысяча дзьвесьце пяцьдзясят чатыры;
13 сыноў Затту — васемсот сорак пяць;
14 сыноў Заккая — семсот шэсьцьдзясят;
15 сыноў Біннуя — шэсьцьсот сорак восем;
16 сыноў Бэвая — шэсьцьсот дваццаць восем;
17 сыноў Азгада — дзьве тысячы трыста дваццаць два;
18 сыноў Аданікама — шэсьцьдзясят сем;
19 сыноў Бігвая — дзьве тысячы шэсьцьсот сем;
20 сыноў Адына — шэсьцьсот пяцьдзясят пяць;
21 сыноў Атэра з [сыноў] Хізкіі — дзевяноста восем;
22 сыноў Хашума — трыста дваццаць восем;
23 сыноў Бэцая — трыста дваццаць чатыры;
24 сыноў Харыфа — сто дваццаць;
25 сыноў Гібэона — дзевяноста пяць;
26 людзей з Бэтлеему і Нэтофы — сто восемдзясят восем;
27 людзей з Анатоту — сто дваццаць восем,
28 людзей з Бэт-Азмавэту — сорак два;
29 людзей з Кірыят-Ярыму, Кэфіры і Бээроту — семсот сорак тры;
30 людзей з Рамы і Гевы — шэсьцьсот дваццаць адзін;
31 людзей з Міхмасу — сто дваццаць два;
32 людзей з Бэтэлю і Гаю — сто дваццаць тры;
33 людзей з Нэво другога — пяцьдзясят два;

34 сыноў Эляма другога — тысяча дзьвесьце пяцьдзясят чатыры;
35 сыноў Харыму — трыста дваццаць;
36 сыноў Ерыхону — трыста сорак пяць;
37 сыноў Лоду, Хадыду і Она — семсот дваццаць адзін;
38 сыноў Сэнаі — тры тысячы дзевяцьсот трыццаць;
39 сьвятары: сыноў Едая, з дому Ешуа — дзевяцьсот семдзясят тры;
40 сыноў Імэра — тысяча пяцьдзясят два;
41 сыноў Пашхура — тысяча дзьвесьце сорак сем;
42 сыноў Харыма — тысяча сямнаццаць;
43 лявіты: сыны Ешуа [з дому] Кадміэля, сыны Гадава — семдзясят чатыры;
44 сьпевакі: сыны Асафа — сто сорак восем;
45 прыдзьвернікі: сыны Шальлюма, сыны Атэра, сыны Тальмона, сыны Аккува, сыны Хатыты, сыны Шавая — сто трыццаць восем;
46 нэтынэі: сыны Цыхі, сыны Хасуфы, сыны Табаота,
47 сыны Кероса, сыны Сіі, сыны Падона,
48 сыны Лебана, сыны Хагавы, сыны Шальмая,
49 сыны Ханана, сыны Гіддэля, сыны Гахара,
50 сыны Рэаі, сыны Рэцына, сыны Нэкоды,
51 сыны Газама, сыны Уззы, сыны Пасэаха,
52 сыны Бэсая, сыны Мэуніма, сыны Нэфушэсіма,
53 сыны Бакбука, сыны Хакуфа, сыны Хархура,
54 сыны Бацліта, сыны Мэхіды, сыны Харшы,
55 сыны Баркоса, сыны Сісэры, сыны Тамаха,
56 сыны Нэцаяха, сыны Хатыфы;
57 сыны слугаў Салямона: сыны Сатая, сыны Сафэрэта, сыны Пэрыды,
58 сыны Яалы, сыны Даркона, сыны Гіддэля,
59 сыны Шэфатыі, сыны Хатылы, сыны Пахэрэт-Гацэбаіма, сыны Амона.
60 Усіх нэтынэяў, сыноў слугаў Салямона — трыста дзевяноста два».
61 А вось тыя, якія прыйшлі з Тэль-Мэляху, Тэль-Харшы, Керуб-Адону і Іммэру, але яны не маглі паказаць дому бацькоў сваіх і насеньня свайго, ці яны з Ізраілю:
62 сыны Дэлаі, сыны Товіі, сыны Нэкоды — шэсьцьсот сорак два.
63 А са сьвятароў: сыны Хабая, сыны Гаккоца, сыны Барзілая, які ўзяў жонку з дачок Барзілая з Гілеаду і быў названы імем іхнім.
64 Яны шукалі свайго запісу ў сьпісах, і ён не знайшоўся; і яны былі адлучаны ад сьвятарства,
65 І Тыршата сказаў ім, каб яны ня елі са сьвятога сьвятых, пакуль не паўстане сьвятара з урымам і тумімам.
66 Уся царква [налічвала] разам сорак дзьве тысячы трыста шэсьцьдзясят [чалавек],
67 апрача слугаў іхніх і служак іхніх, якіх [было] сем тысячаў трыста трыццаць сем; і яны мелі дзьвесьце сорак пяць сьпевакоў і сьпявачак.
68 Коней іхніх [было] семсот трыццаць шэсьць, мулаў іхніх — дзьвесьце сорак пяць,
69 вярблюдаў — чатырыста трыццаць пяць, аслоў — шэсьць тысячаў семсот дваццаць.
70 І некаторыя з галоваў [дамоў] бацькоў далі [сродкі] на працы. Тыршата даў у скарбніцу тысячу драхмаў золата, пяцьдзясят келіхаў, пяцьсот трыццаць шатаў сьвятарскіх.
71 І галовы [дамоў] бацькоў далі ў скарбніцу на працы дваццаць тысячаў драхмаў золата і дзьве тысячы дзьвесьце мінаў срэбра.
72 І рэшта народу далі дваццаць тысячаў драхмаў золата, і дзьве тысячы мінаў срэбра, і шэсьцьдзясят сем шатаў сьвятарскіх.
73 І жылі сьвятары, і лявіты, і прыдзьвернікі, і сьпевакі, і нэтынэі, і [некаторыя] з народу, і ўвесь Ізраіль у гарадах сваіх. І калі настаў сёмы месяц, сыны Ізраіля [былі] ў гарадах сваіх.

Нээм 8

1 І сабраўся народ, як адзін чалавек, на плошчы, якая перад Брамай Воднаю, і сказалі Эзры
кніжніку, каб прынёс кнігу Закону Майсея, якую ГОСПАД загадаў [выконваць] Ізраілю.
2 І прынёс Эзра сьвятар Закон перад аблічча царквы, [што складалася] з мужчынаў і жанчынаў,
і ўсіх, якія разумелі чытанае, у першы дзень сёмага месяца;
3 і чытаў з яго на плошчы, якая перад Брамай Воднаю, ад сьвітанку аж да паўдня перад
мужчынамі, жанчынамі і ўсімі, якія разумелі; і вушы ўсяго народу [былі зьвернуты] да кнігі
Закону.
4 І стаяў кніжнік Эзра на ўзвышэньні драўляным, якое зрабілі дзеля гэтага; і стаялі каля яго:
праваруч яго — Матытыя, Шэмая, Аная, Урыя, Хількія і Маасэя, а леваруч яго — Пэдая, Мішаэль,
Малкія, Хашум, Хашбадана, Захарыя і Мэшулям.
5 І разгарнуў Эзра кнігу на вачах усяго народу, бо ён стаяў па-над усім народам; і калі ён
разгарнуў яе, устаў увесь народ.
6 І дабраславіў Эзра ГОСПАДА, Бога вялікага. І ўвесь народ адказаў: «Амэн, амэн», падымаючы
рукі свае; і пакланіліся, і схіліліся перад ГОСПАДАМ абліччамі да зямлі.
7 І Ешуа, Бані, Шэрэвія, Ямін, Аккуў, Шабэтай, Годыя, Маасэя, Кэліта, Азарыя, Ёзавад, Ханан,
Пэлая і лявіты тлумачылі народу Закон, а народ [стаяў] на месцы сваім.
8 І чыталі з кнігі Закону Божага, і выразна тлумачылі значэньне, і яны разумелі чытанае.
9 І Нээмія, ён жа Тыршата, і Эзра, сьвятар і кніжнік, і лявіты, якія навучалі народ, сказалі ўсяму
народу: «Дзень гэты пасьвячоны ГОСПАДУ, Богу вашаму, ня будзьце ў жалобе і ня плачце», бо
ўвесь народ плакаў, слухаючы словы Закону.
10 І сказаў ім [Нээмія]: «Ідзіце, ешце тлустае і піце салодкае, і пасылайце часткі [страваў] тым,
якія не прыгатавалі сабе; бо дзень гэты пасьвячоны Госпаду, Богу вашаму. І не сумуйце, бо
радасьць ГОСПАДА — гэта апора ваша».
11 І лявіты супакойвалі ўвесь народ, кажучы: «Супакойцеся, бо дзень гэты сьвяты, і не
сумуйце».
12 І пайшоў увесь народ есьці і піць, і пасылаць часткі [страваў], і сьвяткаваць з радасьцю
вялікай, бо зразумелі словы, якія паведамілі ім.
13 І на другі дзень сабраліся галовы [дамоў] бацькоў народу, сьвятары і лявіты да Эзры
кніжніка, каб разважаць словы Закону.
14 І знайшлі напісанае ў Законе, які ГОСПАД загадаў праз рукі Майсея, каб жылі сыны Ізраіля
ў буданах у сьвята, якое ў сёмым месяцы.
15 І таму абвясьцілі і паведамілі ў-ва ўсіх гарадах і ў Ерусаліме, кажучы: «Ідзіце ў горы і
прынясіце галінкі аліўкавыя і галінкі сасновыя, і галінкі міртавыя, і галінкі пальмавыя, і
галінкі дрэваў лісьцястых, і зрабіце буданы згодна з тым, што напісана».
16 І пайшоў народ, і прынесьлі, і зрабілі сабе буданы, кожны на даху сваім, і на панадворках
сваіх, і на панадворках Дому Божага, і на плошчы Брамы Воднай, і на плошчы Брамы Эфраіма.
17 І зрабіла буданы ўся царква тых, якія вярнуліся з палону, і жылі ў буданах. Бо не рабілі так
сыны Ізраіля ад дзён Егошуа, сына Нуна, аж да дня гэтага. І была радасьць вельмі вялікая.
18 І чыталі з кнігі Закону Божага дзень у дзень, ад першага дня аж да апошняга дня. І
сьвяткавалі сьвята сем дзён, а ў восьмы дзень [сабралі] ўрачысты сход паводле пастановы.

Нээм 9

1 А ў дваццаць чацьвёрты дзень гэтага месяца сабраліся сыны Ізраіля ў посьце, і зрэбніцы, і
попел на іх.
2 І аддзялілася насеньне Ізраіля ад усіх чужынцаў, і сталі, і вызнавалі грахі свае і беззаконьні
бацькоў сваіх.
3 І сталі на месцы сваім, і чыталі з кнігі Закону ГОСПАДА, Бога свайго, чвэрць дня, і чвэрць
[дня] вызнавалі [грахі] і пакланяліся ГОСПАДУ, Богу свайму.
4 І сталі на ўзвышэньні лявіты Ешуа, Бані, Кадміэль, Шэванія, Буні, Шэрэвія, Бані, Хенані, і
гукалі голасам вялікім да ГОСПАДА, Бога свайго.

5 І сказалі лявіты Ешуа, Кадміэль, Бані, Хашаўнэя, Шэрэвія, Годыя, Шэванія, Пэтахія:
«Устаньце, дабраславіце ГОСПАДА, Бога свайго, ад веку аж на вякі. Няхай дабраслаўляюць
імя славы Тваёй, і няхай яно будзе ўзьвялічана па-над усе дабраславенствы і хвалу!
6 Ты, ГОСПАДЗЕ, толькі Ты, Ты Сам учыніў нябёсы, нябёсы нябёсаў і ўсё войска іхняе, зямлю
і ўсё, што на ёй, моры і ўсё, што ў іх; і Ты даеш жыцьцё ўсім ім; і войска нябеснае Табе
пакланяецца.
7 Ты, ГОСПАДЗЕ, — Бог, Які выбраў Абрама, і вывеў яго з Уру Халдэйскага, і даў яму імя
Абрагам,
8 і знайшоў сэрца ягонае верным перад абліччам Тваім, і заключыў з ім запавет, каб даць
насеньню ягонаму зямлю Хананейца, Хета, Амарэйца, Пэрэзэя, Евусэя і Гіргашэя; і Ты споўніў
слова Тваё, бо Ты — праведны.
9 І Ты ўбачыў нядолю бацькоў нашых у Эгіпце, і крык іхні пачуў каля Мора Чырвонага.
10 І Ты зьявіў знакі і цуды на фараоне, і на ўсіх слугах ягоных, і на ўсім народзе зямлі ягонай,
бо Ты даведаўся, што яны дзейнічалі падступна супраць іх, і зрабіў Ты Сабе імя аж да дня
сёньняшняга.
11 І Ты разьдзяліў мора перад імі, і яны прайшлі сярод мора па сухмені, а тых, якія гналіся за
імі, Ты ўкінуў у глыбіні, як камень у воды бурлівыя.
12 У слупе воблачным Ты вёў іх удзень, і ў слупе вогненным — уначы, каб асьвятляць ім шлях,
па якім яны ішлі.
13 І Ты зыйшоў на гару Сынай, і гаварыў з імі з неба, і даў ім суды справядлівыя, і законы
праўдзівыя, і пастановы, і прыказаньні добрыя;
14 І пра суботу сьвятую Тваю Ты паведаміў ім, і загадаў ім прыказаньні, пастановы і Закон праз
рукі Майсея, слугі Твайго.
15 І хлеб з неба Ты даваў ім у голадзе іхнім, і ваду са скалы Ты вывеў ім у смазе іхняй, і сказаў
ім, каб яны пайшлі ўзяць у спадчыну зямлю, пра якую Ты ўзьняў руку Тваю, што дасі [яе] ім.
16 Але яны і бацькі нашыя дзейнічалі падступна, і зрабілі цьвёрдымі каркі свае, і ня слухалі
прыказаньняў Тваіх.
17 І яны адмовіліся слухаць [Цябе], і ня памяталі цудаў Тваіх, якія Ты ўчыніў з імі, і зрабілі
цьвёрдымі каркі свае, і ў непаслухмянасьці сваёй паставілі галаву [сабе], каб вярнуцца ў
няволю сваю. Але Ты — Бог, Які прабачаеш, спагадлівы і літасьцівы, павольны да гневу і багаты
на міласэрнасьць, і Ты не пакінуў іх.
18 Нават калі яны зрабілі сабе цяля літое і сказалі: “Гэта бог твой, які вывеў цябе з Эгіпту”, і
рабілі блюзьнерствы вялікія,
19 Ты, у вялікай літасьці Тваёй, не пакінуў іх у пустыні. Слуп воблачны не адыходзіў ад іх
удзень, каб весьці іх па шляху, і слуп вогненны — уначы, каб асьвятляць ім шлях, па якім ісьці.
20 І Духа Твайго добрага Ты даў ім, каб навучаць іх, і манну Тваю не забраў ад вуснаў іхніх, і
ваду даў ім у смазе іхняй.
21 І сорак гадоў Ты жывіў іх у пустыні; яны ня мелі нястачы; адзеньні іхнія не старэлі, і ногі
іхнія ня пухлі.
22 І Ты даў ім валадарствы і народы, і выдзяліў ім [кожны] кут, і яны ўспадкаемілі зямлю
Сыгона, зямлю валадара Хешбону, і зямлю Ога, валадара Башану.
23 І сыноў іхніх Ты памножыў, як зоркі нябесныя, і прывёў іх у тую зямлю, пра якую Ты казаў
бацькам іхнім, што яны ўвойдуць і возьмуць у спадчыну яе.
24 І ўвайшлі сыны іхнія, і ўспадкаемілі зямлю. І Ты скарыў перад імі жыхароў зямлі,
Хананейцаў, і аддаў іх у рукі іхнія, і валадароў іхніх, і народы зямлі [гэтай], каб яны зрабілі з
імі паводле ўпадабаньня свайго.
25 І яны здабылі гарады ўмацаваныя і зямлю ўраджайную, і ўспадкаемілі дамы, поўныя
ўсялякага даброцьця, сажалкі выкапаныя, вінаграднікі, сады аліўныя і мноства дрэваў
пладовых. І яны елі, і насыціліся, і патлусьцелі, і мелі асалоду дзеля вялікай добрасьці Тваёй.
26 І яны сталі непаслухмяныя, і збунтаваліся супраць Цябе, і закінулі Закон Твой за плечы свае,
і забівалі прарокаў Тваіх, якія папярэджвалі іх, каб навярнуць іх да Цябе, і рабілі блюзьнерствы
вялікія.

27 І Ты аддаў іх у рукі прыгнятальнікаў іхніх, і яны ўціскалі іх. І ў часе ўціску свайго яны
клікалі да Цябе, і Ты чуў з неба і, паводле літасьці Тваёй вялікай, Ты даваў ім збаўцаў, і яны
выратоўвалі іх ад рукі прыгнятальнікаў іхніх.
28 Але, калі яны мелі супачынак, ізноў пачыналі рабіць ліхоту перад абліччам Тваім, і Ты
пакідаў іх у руках ворагаў іхніх, і тыя мелі ўладу над імі. І яны навярталіся і клікалі да Цябе, і
Ты чуў іх з неба, і вызваляў іх, паводле літасьці Тваёй, шмат разоў.
29 І Ты папярэджваў іх, каб вярнуць іх да Закону Твайго, але яны дзейнічалі падступна і ня
слухалі прыказаньняў Тваіх, і грашылі супраць судоў Тваіх, праз якія жыць будзе чалавек, калі
будзе выконваць іх, і адвярнулі плечы свае, і зрабілі цьвёрдым карак свой, і ня слухалі [Цябе].
30 І Ты трываў цярпліва іх шмат гадоў, і папярэджваў іх Духам Тваім праз прарокаў Тваіх, але
яны ня слухаліся. І Ты аддаў іх у рукі народаў зямлі.
31 І ў літасьці Тваёй вялікай Ты не аддаў іх на зьнішчэньне, і не пакінуў іх, бо Ты — Бог
літасьцівы і спагадлівы.
32 І цяпер, Божа наш, Божа вялікі, магутны і страшны, Які захоўваеш запавет і міласэрнасьць,
няхай ня будуць малымі перад абліччам Тваім усе цяжкасьці, якія спаткалі валадароў нашых,
князёў нашых, сьвятароў нашых, прарокаў нашых, бацькоў нашых і ўвесь народ Твой ад дзён
валадароў Асірыі аж да дня гэтага.
33 Але Ты — праведны ў-ва ўсім, што прыйшло на нас, бо Ты паводле праўды зрабіў, а мы рабілі
злачынна.
34 І валадары нашыя, князі нашыя, сьвятары нашыя і бацькі нашыя не выконвалі Закон Твой і
не прыхілілі вуха да прыказаньняў Тваіх і сьведчаньняў Тваіх, якімі Ты папярэджваў іх.
35 І яны не служылі Табе ў валадарстве сваім і ў добрасьці Тваёй вялікай, якую Ты даваў ім, і ў
зямлі прасторнай і ўрадлівай, якую Ты даў перад абліччам іхнім, і не адвярнуліся ад учынкаў
сваіх ліхіх.
36 Вось, мы сёньня [сталіся] нявольнікамі, і на зямлі, якую Ты даў бацькам нашым, каб елі яны
плады яе і даброцьці яе, вось, мы [сталіся] нявольнікамі на ёй,
37 а ўраджай шчодры [служыць] валадарам, якіх Ты паставіў над намі за грахі нашыя, і яны
пануюць над целамі нашымі і над скацінай нашай; а мы ў вялікім уціску.
38 І з прычыны ўсяго гэтага мы заключаем дамову і падпісваем [яе], і пячаткі прыкладаюць
князі нашыя, лявіты нашыя і сьвятары нашыя».

Нээм 10

1 Тыя, што прыклалі пячаткі: Нээмія-Тыршата, сын Гахаліі, і Сэдэкія,
2 Сэрая, Азарыя, Ярэмія,
3 Пашхур, Амарыя, Малхія,
4 Хаттуш, Шэванія, Малух,
5 Харым, Мэрэмот, Абадыя,
6 Даніэль, Гіннэтон, Барух,
7 Мэшулям, Абія, Міямін,
8 Маазія, Білгай, Шэмая; гэта сьвятары.
9 І лявіты: Ешуа, сын Азаніі, Біннуй з сыноў Хэнадада, Кадміэль,
10 і браты іхнія: Шэванія, Годыя, Келіта, Пэлая, Ханан,
11 Міха, Рэхоў, Хашавія,
12 Заккур, Шэрэвія, Шэванія,
13 Годыя, Бані, Бэніну.
14 Галовы народу: Парош, Пахат-Мааў, Элям, Затту, Бані,
15 Буні, Азгад, Бэвай,
16 Адонія, Бігвай, Адын,
17 Атэр, Хізкія, Азур,
18 Годыя, Хашум, Бэцай,
19 Харыф, Анатот, Нэвай,
20 Магпіяш, Мэшулям, Хэзір,

21 Мэшэзабэль, Цадок, Яддуа,
22 Пэлятыя, Ханан, Аная,
23 Осія, Хананія, Хашуў,
24 Галяхеш, Пільха, Шавэк,
25 Рэхум, Хашаўна, Маасэя,
26 Ахія, Ханан, Анан,
27 Малух, Харым, Баана.
28 І іншы народ, сьвятары, лявіты, прыдзьвернікі, сьпевакі, нэтынэі і ўсе, якія аддзяліліся ад народаў зямлі [гэтай] дзеля Закону Божага, жонкі іхнія і дочкі іхнія, усе, якія маглі разумець,
29 далучыліся да братоў сваіх, слаўных сваіх, і абавязаліся клятваю і прысягаю хадзіць паводле Закону Божага, які быў дадзены праз рукі Майсея, слугі Божага, і захоўваць, і спаўняць усе прыказаньні ГОСПАДА, Госпада нашага, і прысуды Ягоныя, і пастановы Ягоныя,
30 І не аддаваць дочак нашых народам зямлі гэтай, і дочак іхніх ня браць для сыноў нашых,
31 і калі народы зямлі гэтай прывязуць у суботу тавары або ўсялякае збожжа, каб продаць, ня браць у іх у суботу або ў дзень сьвяты, і пакінуць [сяўбу] ў сёмы год, і [даравацъ] усе даўгі.
32 І прынялі мы для сябе прыказаньне, каб даваць ад кожнага трэцюю частку сыкля на служэньне ў Доме Бога нашага,
33 на хлябы пакладныя, на штодзённую ахвяру хлебную і на штодзённае цэласпаленьне, на суботы, на маладзікі, на сьвяты, на рэчы сьвятыя і на ахвяры за грэх, каб перамольваць за Ізраіля, і на ўсякую працу ў Доме Бога нашага.
34 І кінулі мы жэрабя пра ахвяраваньне дроваў, сьвятары, лявіты і народ, каб прыносіць іх у Дом Бога нашага ў вызначаны час, з году ў год, паводле дамоў бацькоў нашых, каб спальваць іх на ахвярніку ГОСПАДА, Бога нашага, як напісана ў Законе.
35 І мы [прысягнулі] прыносіць пяршыны зямлі нашай і пяршыны ўсіх пладоў усіх дрэваў, з году ў год, у Дом ГОСПАДА,
36 і першародных сыноў нашых і са скаціны нашай, як напісана ў Законе, першародных валоў нашых і авечак нашых прыводзіць у Дом Бога нашага для сьвятароў, якія служаць у Доме Бога нашага.
37 і пачаткі цеста нашага, і дароў нашых, і плод усіх дрэваў, віна і алею прыносіць для сьвятароў у каморы Дому Бога нашага, і дзесяціны зямлі нашай [прыносіць] для лявітаў, і гэтыя лявіты будуць браць дзесяціны ў-ва ўсіх гарадах працы нашай.
38 І сьвятар, сын Аарона, будзе пры лявітах, калі лявіты будуць браць дзесяціны, і лявіты дадуць дзесяціну з дзесяцінаў у Дом Бога нашага, у каморы дому скарбніцы;
39 бо ў гэтыя каморы будуць прыносіць сыны Ізраіля і сыны Левія дары збожжа, віна і алею; і там [таксама] начыньне, якое асьвячонае, сьвятары, якія служаць, прыдзьвернікі і сьпевакі. І мы не пакінем Дому Бога нашага!

Нээм 11

1 І жылі князі народу ў Ерусаліме, а рэшта народу кідала жэрабя, каб адзін з дзесяці жыў у Ерусаліме, горадзе сьвятым, а дзевяць засталіся ў іншых гарадах.
2 І дабраславіў народ усіх тых, якія дабраахвотна вырашалі жыць у Ерусаліме.
3 Гэта галовы краю, якія жылі ў Ерусаліме, а ў гарадах Юдэі жыў кожны ва ўласнасьці сваёй, у гарадах сваіх, Ізраільцяне, сьвятары і лявіты, нэтынэі і сыны слугаў Салямона.
4 А ў Ерусаліме жылі [некаторыя] з сыноў Юды і з сыноў Бэн'яміна. З сыноў Юды: Атая, сын Узіі, сына Захарыі, сына Амарыі, сына Шэфатыі, сына Магалялеля, з сыноў Пэрэса,
5 і Маасэя, сын Баруха, сын Каль-Хазэя, сына Хазаі, сына Адаі, сына Ёярыва, сына Захарыі, сына Гашылоні.
6 Усіх сыноў Пэрэса, якія жылі ў Ерусаліме, [было] чатырыста шэсьцьдзясят восем ваяроў.
7 А гэта сыны Бэн'яміна: Сальлю, сын Мэшуляма, сына Ёэда, сына Пэдаі, сына Калаі, сына Маасэі, сына Ітыэля, сына Ешаі,
8 і за ім Габай, Салай, [разам] дзевяцьсот дваццаць восем.
9 І Ёэль, сын Зіхры, наглядчык над імі, і Юда, сын Гасэнуі, — другі [наглядчык] над горадам.

10 Са сьвятароў: Едая, сын Ёярыва, Яхін,
11 Сэрая, сын Хількіі, сына Мэшуляма, сына Цадока, сына Мэраёта, сына Ахітува, начальнік у Доме Божым,
12 і браты іхнія, якія рабілі працу ў Доме — васемсот дваццаць два; і Адая, сын Ерахама, сына Пэлаліі, сына Амцы, сына Захарыі, сына Пашхура, сына Малькіі,
13 і браты ягоныя, галовы [дамоў] бацькоў — дзьвесьце сорак два; і Амашсай, сын Азарэля, сына Ахзая, сына Мэшылемота, сына Імэра,
14 і браты ягоныя, ваяры мужныя — сто дваццаць восем. А наглядчык над імі — Заўдыэль, сын Гагедаліма.
15 А з лявітаў: Шэмая, сын Хашува, сына Азрыкама, сына Хашавіі, сына Буні,
16 і Шабэтай, і Ёзавад, якія былі над вонкавымі працамі Дому Божага; [яны] — галовы лявітаў,
17 і Маттанія, сын Міхі, сына Заўдыя, сына Асафа, галоўны пачынальнік хвалы пры малітве, і Бакбукія, другі сярод братоў ягоных, і Аўда, сын Шамуа, сына Галала, сына Едутуна.
18 Усіх лявітаў у горадзе — дзьвесьце восемдзясят чатыры.
19 І прыдзьвернікі: Аккуў, Тальмон і браты іхнія, якія вартавалі ў брамах — сто семдзясят два.
20 А рэшта Ізраіля, сьвятары і лявіты [жылі] ў-ва ўсіх гарадах Юдэі, кожны ў спадчыне сваёй.
21 А нэтынэі жылі ў Афэле; а Цыха і Гішпа [былі] над нэтынэямі.
22 А наглядчыкам над лявітамі ў Ерусаліме [быў] Узі, сын Бані, сына Хашавіі, сына Маттаніі, сына Міхі, з сыноў Асафа, сьпевакоў, якія былі на службе ў Доме Божым,
23 бо быў загад валадара адносна іх, і вызначана, хто павінен сьпяваць, дзень у дзень.
24 А Пэтахія, сын Мэшэзабэля, з сыноў Зэраха, сына Юды, быў пад рукою валадара ў-ва ўсіх справах адносна народу.
25 Адносна паселішчаў з палямі іхнімі: сыны Юды жылі ў Кірыят-Арбе і вёсках ейных, і ў Дыбоне і ў вёсках ягоных, і ў Екаўцэлю і вёсках ягоных,
26 і ў Ешуі, і ў Малодзе, і ў Бэт-Палеце,
27 і ў Хацар-Шуале, і ў Бээр-Шэве і вёсках ейных,
28 і ў Цыклазе, і ў Мэхоне і ў вёсках ейных,
29 і ў Эн-Рымоне, і ў Цоры, і ў Ярмуце,
30 у Занааху, у Адуламе і вёсках іхніх, у Ляхішу і ваколіцах ягоных, у Азэцы і вёсках ейных. І яны расьсяліліся ад Бээр-Шэвы аж да даліны Гінном.
31 А сыны Бэн'яміна [жылі] ў Міхмасе, Гаі, Бэтэлі і вёсках іхніх,
32 Анатоце, Нове, Ананіі,
33 Хацоры, Раме, Гіттаіме,
34 Хадызе, Цэвоіме, Нэвалце,
35 Лодзе, Оне ў даліне Харашым.
36 І [некаторыя] лявіты з чэргаў Юды [жылі ў] Бэн'яміна.

Нээм 12

1 Вось сьвятары і лявіты, якія прыйшлі з Зэрубабэлем, сынам Шэалтыэля, і з Ешуа: Сэрая, Ярэмія, Эзра,
2 Амарыя, Малух, Хаттуш,
3 Шэханія, Рэхум, Мэрэмот,
4 Іддо, Гінетой, Абія,
5 Міямін, Маадыя, Більга,
6 Шэмая, Еярыў, Едая,
7 Салу, Амок, Хількія, Едая. Гэта галовы сьвятароў і браты іхнія ў дні Ешуа.
8 І лявіты: Ешуа, Біннуй, Кадміэль, Шэрэвія, Юда, Маттанія, які [кіраваў] гімнамі падзякі, ён і браты ягоныя.
9 А Бакбукія і Уньні, і браты іхнія [стаялі] насупраць іх на варце [сваёй] паводле чаргі.
10 І Ешуа нарадзіў Ёякіма, Ёякім нарадзіў Эліяшыва, Эліяшыў [нарадзіў] Ёяду,
11 Ёяда нарадзіў Ёнатана, Ёнатан нарадзіў Яддуя.

12 А ў дні Ёякіма былі сьвятары галовамі [дамоў] бацькоў: у [доме] Сэраі — Мэрая, у Ярэміі —
Хананія,
13 у Эзры — Мэшулям, у Амарыі — Ёгаханан,
14 у Малуха — Ёнатан, у Шэваніі — Язэп,
15 у Харыма — Адна, у Мэраёта — Хэлкай,
16 у Іддо — Захарыя, у Гінэтона — Мэшулям,
17 у Абіі — Зіхры, у Мін'яміна і Маода — Пілтай,
18 у Більгі — Шамуа, у Шэмаі — Еганатан,
19 у Ёярыва — Матэнай, у Едаі — Узьзі,
20 у Салая — Калай, у Амока — Евэр,
21 у Хількіі — Хашавія, у Едая — Натанаэль.
22 Лявіты, галовы [дамоў] бацькоў былі запісаныя ў дні Эліяшыва, Ёяды, Ёханана і Яддуа, а
сьвятары — за валадараньня Дарыя Пэрса.
23 Сыны Левія, галовы [дамоў] бацькоў, былі запісаныя ў кнігу летапісу аж да дзён Ёханана,
сына Эліяшыва.
24 І галовамі лявітаў [былі]: Хашавія, Шэрэвія, Ешуа, сын Кадміэля, і браты іхнія, [якія стаялі]
насупраць іх, каб выхваляць і дзякаваць [Богу], паводле загаду Давіда, чалавека Божага, чарга
за чаргою.
25 Маттанія, Бакбукія, Абадыя, Мэшулям, Тальмон, Аккуў, прыдзьвернікі, вартавалі пры
каморах каля брамаў.
26 Яны [былі] ў дні Ёякіма, сына Ешуа, сына Ёцадака, і ў дні Нээміі, ваяводы, і Эзры, сьвятара і
кніжніка.
27 А на пасьвячэньне муру Ерусаліму шукалі лявітаў у-ва ўсіх месцах іхніх, каб прывесьці іх у
Ерусалім і зрабіць пасьвячэньне з радасьцю, і з падзякаю, і са сьпевамі, псалтырамі і гусьлямі.
28 І сабраліся сыны сьпевакоў з ваколіцаў Ерусаліму і з вёсак Нэтофацян,
29 і з дому Бэт-Гагільгаму, і з палёў Гевы і Азмавэту, бо сьпевакі пабудавалі сабе паселішчы
вакол Ерусаліму.
30 І ачысьціліся сьвятары і лявіты, і ачысьцілі народ, і брамы, і мур.
31 І я прывёў князёў Юдэі на мур, і паставіў два хоры вялікія. Адзін з іх ішоў направа, па муры
да Брамы Гною.
32 За імі ішоў Гашая і палова князёў Юдэі,
33 і Азарыя, Эзра, Мэшулям,
34 Юда, Бэн'ямін, Шэмая і Ярэмія.
35 А з сыноў сьвятарскіх з трубамі [ішлі] Захарыя, сын Ёнатана, сына Шэмаі, сына Маттаніі,
сына Міхая, сына Заккура, сына Асафа,
36 і браты ягоныя: Шэмая, Азарэль, Мілалай, Гілалай, Маай, Нэтанэль, Юда, Ханані з
музычнымі інструмэнтамі Давіда, чалавека Божага, і Эзра кніжнік [ішоў] перад імі.
37 І каля Брамы Крыніцы, [якая была] насупраць іх, яны ўзыйшлі па прыступках гораду Давіда
на мур вышэй дому Давіда, аж да Брамы Воднай на ўсходзе.
38 І другі хор ішоў насустрач ім, і за ім я і палова народу па муры ад Вежы Печаў аж да Муру
Шырокага,
39 і ад Брамы Эфраіма, [мінаючы] Браму Старую, Браму Рыбную, Вежу Хананэля і Вежу Мэа аж
да Брамы Авечай, і спыніліся пры Браме Варты.
40 І сталі абодва хоры ў Доме Божым, і я і палова кіраўнікоў [народу] са мною,
41 і сьвятары: Эліякім, Маасэя, Мін'ямін, Міхая, Эліяэнай, Захарыя, Хананія з трубамі,
42 і Маасэя, Шэмая, Элеазар, Узьзі, Ягахана, Малькія, Элям, Эзэр. І сьпявалі сьпевамі голасна, і
Ізахія [быў] кіраўніком [у іх].
43 І ахвяроўвалі ў той дзень ахвяры вялікія, і весяліліся, бо Бог узрадаваў іх радасьцю вялікаю.
Таксама жанчыны і дзеці радаваліся, і радасьць Ерусаліму была чуваць далёка.
44 І былі прызначаны ў той дзень людзі, [адказныя за] каморы, каб складаць дары, пяршыны і
дзесяціны, каб зьбіраць у іх з палёў пры гарадах часткі, [прызначаныя] ў Законе для сьвятароў
і лявітаў, бо радасьць [была ў] Юдэі з прычыны сьвятароў і лявітаў, якія стаялі [там].

45 І яны захоўвалі пастановы Бога свайго і пастановы пра ачышчэньні, і [былі] сьпевакамі і
прыдзьвернікамі паводле загаду Давіда і Салямона, сына ягонага.
46 Бо ў дні Давіда і Асафа здаўна [былі] вызначаны галовы сьпевакоў і сьпевы хвалы і падзякі
Богу.
47 І ўвесь Ізраіль у дні Зэрубабэля і ў дні Нээміі даваў часткі [маёмасьці] для сьпевакоў і
прыдзьвернікаў; і давалі сьвятыя [ахвяры] лявітам, а лявіты давалі сьвятыя [ахвяры] сынам
Аарона.

Нээм 13

1 У той дзень чыталі з кнігі Майсея ў вушы народу і знайшлі напісанае ў ёй, што ня ўвойдзе
Аманянін і Мааўлянін у царкву Божую на вякі,
2 бо яны не сустрэлі сыноў Ізраіля з хлебам і вадою, і нанялі супраць іх Білеама, каб праклінаць
іх; але Бог наш перамяніў праклён у дабраславенства.
3 І сталася, калі яны пачулі Закон гэты, яны аддзялілі ад Ізраіля ўсю чужаземшчыну.
4 А перад гэтым Эліяшыў сьвятар, які меў нагляд над пакоямі Дому Бога нашага, сваяк Товіі,
5 зрабіў для яго вялікі пакой, дзе раней складалі ахвяры хлебныя, кадзіла, начыньні і дзесяціны
збожжа, віна і алею, прызначаныя для лявітаў, сьпевакоў і прыдзьвернікаў, і дары для
сьвятароў.
6 Але ў час усяго гэтага я ня быў у Ерусаліме, бо ў трыццаць другім годзе Артарксэркса,
валадара Бабілонскага, я пайшоў да валадара і праз пэўны час выпрасіўся, [каб адыйсьці] ад
валадара.
7 І я прыйшоў у Ерусалім, і зразумеў, якое ліха ўчыніў Эліяшыў дзеля Товіі, зрабіўшы пакой
яму ў панадворках Дому Божага.
8 І было гэта вельмі ліхім для мяне, і я выкінуў усе хатнія рэчы Товіі прэч з пакою.
9 І я сказаў, і ачысьцілі пакой, і я вярнуў туды ізноў рэчы Дому Божага, ахвяры хлебныя і
кадзіла.
10 І я даведаўся, што [належныя] часткі ахвяраў не давалі лявітам, і яны разьбегліся, кожны да
поля свайго, лявіты і сьпевакі, якія рабілі працу сваю.
11 І я насварыўся на кіраўнікоў [лявітаў], і сказаў: «Чаму вы пакінулі Дом Божы?» І я сабраў
[лявітаў], і паставіў іх на месца іхняе.
12 І ўся Юдэя прыносіла дзесяціну збожжа, віна і алею ў скарбніцы.
13 І я паставіў над скарбніцамі Шэлемію сьвятара і Цадока кніжніка, і Бэдаю з лявітаў, і пад
руку іхнюю Ханана, сына Заккура, сына Маттаніі, бо іх лічылі вернымі. І да іх [належала]
разьдзяляць [належнае] братам сваім.
14 Узгадай пра мяне, Божа мой, дзеля гэтага і ня вытры добрых учынкаў маіх, якія я зрабіў для
Дому Божага і для абслугі яго.
15 У гэтыя дні я бачыў у Юдэі тых, якія тапталі [віно] ў тоўчнях у суботу, і вазілі снапы,
накладалі [рэчы] на аслоў, і таксама віно, вінаград, фігі і ўсякія цяжары, і прывозілі ў Ерусалім
у дзень супачынку. І я папярэджваў іх у той дзень, калі яны продалі жыўленьне.
16 І Тырыяне жылі [таксама] там, і прывозілі рыбу і ўсялякі тавар, і продалі ў суботу сынам
Юдэі ў Ерусаліме.
17 І я сварыўся на шляхту Юдэі, і сказаў ім: «Што гэта за справа ліхая, якую вы робіце і паганіце
дзень супачынку?
18 Ці ня так рабілі бацькі вашыя, і прывёў Бог наш на нас і на горад гэты ўсё гэтае ліха? А вы
павялічваеце гнеў [Божы] на Ізраіля, паганячы суботу».
19 І сталася, што калі падаў змрок на брамы Ерусаліму перад суботаю, я сказаў, каб замыкалі
вароты, і я сказаў, каб іх не адчынялі аж да сканчэньня суботы. І юнакоў сваіх я паставіў пры
брамах, каб не прыносілі цяжараў у дзень супачынку.
20 І начавалі гандляры і прадаўцы ўсякага тавару звонку Ерусаліму адзін раз і другі.
21 І я папярэдзіў іх, і сказаў ім: «Чаму вы начуеце каля муроў? Калі вы ізноў гэтак зробіце, я
падыму руку на вас». З таго часу яны не прыходзілі ў суботу.

22 І я сказаў лявітам, каб яны ачысьціліся і прыйшлі вартаваць пры брамах, каб сьвяціць дзень
супачынку. Таксама гэта ўзгадай пра мяне, Божа мой, і пашкадуй мяне паводле вялікасьці
міласэрнасьці Тваёй!
23 Таксама ў тыя дні я бачыў Юдэяў, якія жылі з жанчынамі з Ашдадзянак, Аманянак і
Мааўлянак,
24 і сыны іхнія на палову гаварылі па-ашдодзку, і ня ўмелі гаварыць па-юдэйску, але [гаварылі]
моваю таго ці іншага народу.
25 І я сварыўся на іх, і праклінаў іх, і біў некаторых з іх, і рваў у іх валасы, і запрысягаў іх Богам,
[кажучы]: «Не аддавайце дочак вашых сынам іхнім і не бярыце дочак іхніх сынам сваім і сабе.
26 Ці ня з іх прычыны саграшыў Салямон, валадар Ізраіля? У шмат якіх народаў не было
валадара, як ён, і ён быў умілаваным Богам сваім, і Бог паставіў яго валадаром над усім
Ізраілем; але нават яго ўвялі ў грэх жонкі чужаземныя.
27 Ці ж можна нам чуць пра вас, што вы робіце ўсё гэтае ліха вялікае, стаўшы нявернымі Богу
нашаму, жывучы з жанчынамі чужынскімі?»
28 І [адзін] з сыноў Ёяды, сына Эліяшыва, вялікага сьвятара, быў зяцем Санвалата Харанянінa,
і я прагнаў яго ад сябе.
29 Узгадай ім, Божа мой, што яны апаганілі сьвятарства і запавет сьвятарства і лявітаў!
30 І я ачысьціў іх ад усяго чужынскага, і паставіў чэргі сьвятароў і лявітаў, кожнага ў служэньні
сваім.
31 і я [пастанавіў] пра ахвяраваньне дроваў у вызначаны час і пра пяршыны. Узгадай пра мяне,
Божа мой, на дабро [мне]!

КНІГА ЭСТЭР

1 І сталася [гэта] ў дні Ахашвэроша. Гэты Ахашвэрош валадарыў ад Індыі аж да Куша [і меў]
сто дваццаць сем акругаў.
2 У тыя дні, калі валадар Ахашвэрош сядзеў на пасадзе валадарства свайго, які ў Шушане
сталіцы,
3 у трэці год валадараньня свайго ён справіў гасьціну для ўсіх князёў сваіх і слугаў сваіх,
гетманаў Пэрсаў і Мідзянаў, магнатаў і князёў акругаў, што былі перад ім,
4 паказваючы багацьце славы валадарства свайго і гонар красы велічнасьці сваёй шмат дзён,
сто восемдзясят дзён.
5 Пасьля сканчэньня дзён гэтых валадар справіў гасьціну для ўсяго народу, які знаходзіўся ў
Шушане сталіцы, ад вялікага аж да малога, сем дзён у садовым панадворку палацу валадара.
6 Белыя, зялёныя і блакітныя тканіны былі прымацаваныя шнурамі з вісону і пурпуру да
кольцаў срэбных і слупоў мармуровых. Залатыя і срэбныя ложкі [стаялі] на падлозе з
алябастру, пэрлаў і чорнага мармуру.
7 І напоі ў посудзе залатым, і посуд ад посуду адрозьніваўся, і віна валадарскага шмат, паводле
[магчымасьці] рукі валадара.
8 І да піцьця паводле загаду не было прымусу, бо валадар так вызначыў усёй службе дому
свайго, каб яны рабілі паводле жаданьня кожнага.
9 Таксама Вашці валадарка справіла банкет для жанчынаў у доме валадарскім, які [належаў]
валадару Ахашвэрошу.
10 У сёмы дзень, калі добра стала на сэрцы валадара ад віна, ён сказаў Мегуману, Бізэце,
Харбоне, Бігце і Абагце, Зэтару і Каркасу, сямём эўнухам, якія служылі перад абліччам
валадара Ахашвэроша,
11 каб яны прывялі перад аблічча валадара валадарку Вашці ў кароне валадарскай, каб
паказаць народу і князям прыгажосьць ейную, бо яна была вельмі прыгожая.
12 І адмовілася валадарка Вашці прыйсьці паводле слова валадара да эўнухаў. І моцна
загневаўся валадар, і гнеў ягоны ўзгарэўся ў ім.
13 І сказаў валадар да мудрацоў, якія ведаюць часы, бо справа валадара [ішла] да ўсіх, што
ведалі законы і суд.
14 А найбліжэйшымі да яго былі Каршэна, Шэтар, Адмата, Таршыш, Мэрэс, Марсэн і Мэмухан
— сем князёў Пэрсаў і Мідзянаў, якія бачылі аблічча валадара і сядзелі першымі ў валадарстве.
15 «Што зрабіць паводле законаў з валадаркай Вашці за тое, што яна не зрабіла паводле слова
валадара Ахашвэроша, [дадзенага] праз рукі эўнухаў?»
16 І сказаў Мэмухан перад абліччам валадара і князёў: «Не перад адным валадаром завінілася
валадарка Вашці, а перад усімі князямі і перад усімі народамі, якія ў-ва ўсіх акругах валадара
Ахашвэроша.
17 Бо разыйдзецца слова пра валадарку да ўсіх жанчынаў, і яны будуць грэбаваць мужамі
сваімі, і казаць: “Валадар Ахашвэрош сказаў, каб прывялі валадарку Вашці перад аблічча сваё,
а яна не прыйшла”.
18 І сёньня княгіні Пэрсаў і Мідзянаў, якія пачулі пра словы валадаркі, тое самае скажуць усім
князям валадара; і будзе шмат пагарды і абурэньня, і злосьці.
19 Калі валадар [палічыць] добрым, няхай выйдзе слова валадара ад яго, і няхай будзе ўпісана
ў законы Пэрсаў і Мідзянаў і ня будзе адменена, што Вашці ня прыйдзе [больш] перад аблічча
валадара Ахашвэроша, і годнасьць валадарскую ейную няхай дасьць валадар іншай, лепшай
за яе.
20 І пачуюць загад валадара, які ён зробіць у-ва ўсім валадарстве сваім, хоць яно вялікае, і ўсе
жанчыны будуць шанаваць мужоў сваіх ад вялікага аж да малога».
21 І добрым было слова гэтае ў вачах валадара і князёў, і зрабіў валадар паводле слова
Мэмухана.

22 І ён паслаў лісты ў-ва ўсе акругі валадарскія, у кожную акругу пісьмом ейным і да кожнага
народу — моваю ягонай, каб кожны муж быў гаспадаром у доме сваім, і прамоўлена гэта было
моваю ўсіх народаў.

Эст 2

1 Пасьля гэтых падзеяў, калі суцішыўся гнеў валадара Ахашвэроша, ён узгадаў пра Вашці, і пра
тое, што яна зрабіла, і што было пастаноўлена пра яе.
2 І сказалі валадару юнакі, якія служылі яму: «Няхай пашукаюць валадару дзяўчын паненак,
прыгожых выглядам.
3 І няхай прызначыць валадар наглядчыкаў у-ва ўсіх акругах валадарства свайго, і няхай яны
зьбяруць усіх дзяўчат паненак прыгожага выгляду ў Шушан сталіцу, у дом жанчынаў пад
нагляд Гэгая, эўнуха валадара, вартаўніка жонак, і няхай дадуць ім адмысловыя масьці.
4 І няхай дзяўчына, якая будзе найлепшай у вачах валадара, будзе валадаркай замест Вашці».
І добрым было гэта слова ў вачах валадара, і ён зрабіў гэтак.
5 Муж Юдэй быў у Шушане сталіцы; імя ягонае — Мардэхай, сын Яіра, сына Шымэя, сына Кіша,
муж з [калена] Бэн'яміна,
6 які быў узяты з Ерусаліму разам з палонам, які быў выведзены з Ехоніем, валадаром Юды,
якога перасяліў Навухаданосар, валадар Бабілонскі.
7 І быў ён выхавацелем Гадасы, яна ж — Эстэр, дачкі дзядзькі свайго, бо не было ў яе ані бацькі,
ані маці. Дзяўчына гэта мела прывабную постаць і прыгожы выгляд. І пасьля сьмерці бацькі
ейнага і маці ейнай Мардэхай узяў яе сабе за дачку.
8 І было абвешчана слова валадара і загад ягоны, і сабралі шмат дзяўчат у Шушан сталіцу пад
нагляд Гэгая, і была ўзята Эстэр у дом валадара пад нагляд Гэгая, вартаўніка жонак.
9 І была лепшай дзяўчына гэтая ў вачах ягоных, і мела ласку ў яго, і ён пасьпяшаўся даць ёй
адмысловыя масьці і прызначанае ёй, і сем дзяўчат даў ёй з дому валадара; і перамясьціў яе і
дзяўчат ейных у найлепшае [месца] дому жанчынаў.
10 Ня выявіла Эстэр народу свайго і паходжаньня свайго, бо Мардэхай загадаў ёй, каб яна не
выяўляла [гэтага].
11 І кожны дзень Мардэхай прыходзіў да панадворку дому жанчынаў, каб даведацца, як маецца
Эстэр і што робіцца з ёю.
12 І прыходзіла чарга кожнай дзяўчыне ўваходзіць да валадара Ахашвэроша пры сканчэньні
дванаццаці месяцаў знаходжаньня іх паводле закону жонак, бо столькі цягнуцца дні
падрыхтоўкі іхняй, шэсьць месяцаў — алеем міра і шэсьць месяцаў — пахошчамі і
адмысловымі масьцямі жаночымі.
13 І тады дзяўчына ўваходзіла да валадара, і ўсё, што яна казала, давалі ёй, калі яна ішла з дому
жанчынаў у дом валадара.
14 Увечары яна ішла, а раніцаю вярталася ў другі дом жанчынаў, пад нагляд Шаашгаза,
эўнуха валадара, вартаўніка наложніцаў; і ўжо не прыходзіла да валадара, хіба толькі валадар
пажадаў яе, і паклікалі яе на імя.
15 Калі прыйшла чарга Эстэр, дачкі Абіхаіла, дзядзькі Мардэхая, якую ён узяў сабе за дачку,
ісьці да валадара, тады яна не прасіла нічога, акрамя таго, пра што сказаў ёй Гэгай, эўнух
валадара, вартаўнік жонак. І мела Эстэр зычлівасьць у вачах усіх, хто бачыў яе.
16 І была Эстэр узятая да валадара Ахашвэроша ў валадарскі дом ягоны, у дзясяты месяц,
значыцца месяц Тэвэт, у сёмы год валадараньня ягонага.
17 І пакахаў валадар Эстэр па-над усіх жанчынаў, і яна мела ў яго ласку і зычлівасьць па-над
усіх дзяўчынаў; і ён узлажыў карону валадарскую на галаву ейную, і зрабіў яе валадаркаю
замест Вашці.
18 І справіў валадар банкет вялікі для ўсіх князёў сваіх і слугаў сваіх, банкет дзеля Эстэр, і
зрабіў палёгку акругам, і раздаў дары з рукі валадара.
19 А калі зьбіралі дзяўчын другі раз, Мардэхай сядзеў пры браме валадарскай,
20 Эстэр не выяўляла паходжаньня свайго і народу свайго, як загадаў ёй Мардэхай; а слова
Мардэхая Эстэр выконвала гэтаксама, як тады, калі была ў яго на выхаваньні.

21 У тыя дні, калі Мардэхай сядзеў пры браме валадарскай, разгневаліся Бігтан і Тэрэш, два
эўнухі валадара, якія вартавала парогі, і шукалі, каб выцягнуць руку на валадара Ахашвэроша.
22 І даведаўся пра гэтую справу Мардэхай, і паведаміў валадарцы Эстэр, а Эстэр пераказала
валадару ад імя Мардэхая.
23 І дасьледавалі справу гэтую і знайшлі, і іх абодвух павесілі на дрэве. І запісалі [пра гэта] ў
кнігу летапісаў перад абліччам валадара.

Эст 3

1 Пасьля гэтых падзеяў узьвялічыў валадар Ахашвэрош Амана, сына Гамэдата, Агагяніна, і
ўзьняў яго, і паставіў пасад ягоны вышэй за ўсіх князёў, якія [былі] з ім.
2 І ўсе слугі валадара, якія [былі] пры браме валадарскай, кленчылі і схіляліся перад Аманам,
бо гэтак загадаў валадар. А Мардэхай ня кленчыў і не схіляўся.
3 І сказалі слугі валадара, якія пры браме валадарскай, Мардэхаю: «Чаму ты парушаеш
прыказаньне валадара?»
4 І сталася, што яны гаварылі яму кожны дзень, а ён ня слухаў іх, і яны данесьлі Аману, каб
паглядзець, ці вытрывае ў слове Мардэхай, бо ён выявіў, што ён — Юдэй.
5 І ўбачыў Аман, што Мардэхай ня кленчыць і не пакланяецца яму, і напоўніўся Аман гневам.
6 І ён пагрэбаваў у вачах сваіх узьняць руку сваю на аднаго Мардэхая, але калі выявілі
яму народ Мардэхая, шукаў Аман, каб выгубіць усіх Юдэяў, народ Мардэхая, які ў-ва ўсім
валадарстве Ахашвэроша.
7 У першы месяц, значыцца месяц Нісан, у дванаццаты год валадара Ахашвэроша, кідалі пур,
значыцца жэрабя, перада абліччам Амана дзень пры дні, месяц пры месяцы, і [жэрабя выпала]
на дванаццаты [месяц] Адар.
8 І сказаў Аман валадару Ахашвэрошу: «Ёсьць адзін народ, расьцярушаны і падзелены паміж
народамі ў-ва ўсіх акругах валадарства твайго; і законы іхнія розьняцца ад [законаў] усіх
народаў, і законаў валадара яны не выконваюць; і валадару не карысна пакінуць іх [без увагі].
9 Калі валадару гэта [падаецца] добрым, няхай будзе напісана, каб яны былі выгублены; і я
адважу дзесяць тысячаў талентаў срэбра на рукі тых, якія зробяць гэтую працу, каб занесьлі ў
скарбніцу валадара».
10 І зьняў валадар сыгнэт свой з рукі сваёй, і даў яго Аману, сыну Гамэдата, Агагяніну, ворагу
Юдэяў.
11 І сказаў валадар Аману: «Срэбра гэтае аддаю табе, і народ гэты. Рабі з ім, як добра ў вачах
тваіх».
12 І паклікалі пісараў валадарскіх у трынаццаты дзень першага месяца, і яны напісалі ўсё, што
загадаў Аман, да сатрапаў валадара і да ваяводаў, якія ў кожнай акрузе, і князям кожнага
народу, у кожную акругу пісьмом ейным і кожнаму народу — моваю ягонай; напісалі ад імя
валадара Ахашвэроша і запячаталі сыгнэтам валадара.
13 І пасланы былі лісты ганцамі ў-ва ўсе акругі валадарскія, каб вынішчыць, забіць і выгубіць
усіх Юдэяў, ад юнака аж да старога, дзяцей і жанчынаў, у адзін дзень, трынаццаты дзень
дванаццатага месяца, значыцца месяца Адар, і маёмасьць іхнюю разрабаваць.
14 Водпіс гэтага пісаньня каб быў перададзены як закон у кожную акругу, каб быў абвешчаны
ўсім народам, каб яны былі гатовыя да гэтага дня.
15 Ганцы выйшлі, сьпяшаючыся паводле слова валадара, і закон быў абвешчаны ў Шушане
сталіцы. І валадар і Аман селі, каб піць, а горад Шушан быў у замяшаньні.

Эст 4

1 А Мардэхай даведаўся пра ўсё, што зрабілася, і разьдзёр Мардэхай шаты свае, і апрануў на
сябе зрэбніцу і попел; і выйшаў на сярэдзіну гораду, і крычаў крыкам вялікім і голасным.
2 І прыйшоў аж да брамы валадарскай, бо нельга было ўваходзіць у браму валадарскую ў
зрэбніцы.
3 І ў кожнай акрузе і месцы, куды дайшло слова валадара і закон ягоны, была вялікая жалоба
ў Юдэяў, і пост, і плач, і галашэньне; і зрэбніца і попел сталіся ложкам для мноства.

4 І прыйшлі дзяўчаты Эстэр і эўнухі ейныя, і паведамілі ёй, і вельмі захвалявалася валадарка,
і паслала шаты, каб Мардэхай апрануў [іх] і зьняў з сябе зрэбніцу сваю, але ён не прыняў.
5 І паклікала Эстэр Гатаха, [аднаго] з эўнухаў валадара, якога ён прыставіў да яе, і загадала
даведацца пра Мардэхая, што гэта і чаму гэта.
6 І пайшоў Гатах да Мардэхая на гарадзкую плошчу, якая перад брамай валадарскай.
7 І паведаміў яму Мардэхай пра ўсё, што адбылося з ім, і пра вызначаную [вагу] срэбра, якое
абяцаў Аман адважыць у скарбніцу валадарскую за Юдэяў, каб выгубіць іх.
8 І даў яму водпіс ліста закону, выдадзенага ў Шушане на вынішчэньне [Юдэяў], каб паказаў
Эстэр і паведаміў ёй, і загадаў ёй, каб яна пайшла да валадара маліць яго і прасіць яго за народ
свой.
9 І прыйшоў Гатах, і паведаміў Эстэр словы Мардэхая.
10 І сказала Эстэр Гатаху, і загадала [пераказаць] Мардэхаю:
11 «Усе слугі валадара і народ акругаў валадарскіх ведаюць, што для кожнага мужчыны і
жанчыны, хто ўвойдзе да валадара на ўнутраны панадворак, калі яго ня клікалі, адзін закон
— мае быць забіты. І толькі той, да каго выцягне валадар скіпетр свой залаты, будзе жыць. А
мяне ня клікалі, каб прыйсьці да валадара, вось ужо трыццаць дзён».
12 І ён паведаміў Мардэхаю словы Эстэр.
13 І сказаў Мардэхай, каб адказалі Эстэр: «Ня думай у душы тваёй, што ты [адна] з усіх Юдэяў
уцячэш у доме валадарскім [ад загубы].
14 Бо калі моўчкі прамаўчыш у гэты час, палёгка і выратаваньне прыйдзе для Юдэяў з іншага
месца, а ты і дом бацькі твайго загінеце. І хто ведае, ці ня дзеля такога часу, як гэты, ты
дасягнула валадарства?»
15 І сказала Эстэр, каб адказалі Мардэхаю:
16 «Ідзі, зьбяры ўсіх Юдэяў, якія знаходзяцца ў Шушане, і посьціце за мяне, і ня ешце і ня піце
тры дні, ані ўдзень, ані ўначы; і я, і дзяўчаты мае будзем таксама посьціць, і тады я пайду да
валадара, хоць гэта не паводле закону, і калі маю загінуць, дык загіну».
17 І адыйшоў Мардэхай, і зрабіў усё, як загадала яму Эстэр.

Эст 5

1 І сталася на трэці дзень, і апранулася Эстэр у [шаты] валадарскія, і стала на ўнутраным
панадворку дому валадара, насупраць дому валадара. А валадар сядзеў на валадарскім
пасадзе сваім у доме валадарскім насупраць уваходу ў дом.
2 І сталася, калі валадар убачыў валадарку Эстэр, якая стаіць на панадворку, яна знайшла ласку
ў вачах ягоных, і выцягнуў валадар да Эстэр скіпетр залаты, які ў руцэ ягонай, і наблізілася
Эстэр, і дакранулася да скіпетра.
3 І сказаў ёй валадар: «Што табе, валадарка Эстэр, і якая просьба твая? Нават палова
валадарства будзе дадзена табе».
4 І сказала Эстэр: «Калі добра для валадара, няхай прыйдзе валадар і Аман сёньня на гасьціну,
якую я прыгатавала яму».
5 І сказаў валадар: «Прысьпешце Амана, каб зрабіць паводле слова Эстэр». І прыйшоў валадар
і Аман на гасьціну, якую прыгатавала Эстэр.
6 І сказаў валадар Эстэр, выпіўшы віна: «Якое жаданьне тваё? І будзе дадзена табе. І якая
просьба твая? Аж да паловы валадарства, і будзе выканана».
7 І адказала Эстэр, і сказала: «Вось жаданьне маё і просьба мая:
8 Калі я знайшла ласку ў вачах валадара, і калі добра для валадара паслухаць жаданьне маё і
зрабіць паводле просьбы маёй, няхай прыйдзе валадар і Аман на гасьціну, якую я зраблю ім, і
заўтра я зраблю паводле слова валадара».
9 І выйшаў Аман у той дзень вясёлы і з добрым [настроем] сэрца. І ўбачыў Аман Мардэхая ў
браме валадарскай, і той ня ўстаў, і не крануўся з месца перад ім, і напоўніўся Аман гневам
на Мардэхая.
10 І апанаваў сябе Аман, і прыйшоў у дом свой, і паслаў паклікаць да сябе сяброў сваіх і Зэрэш,
жонку сваю.

11 І распавёў ім Аман пра славу багацьця свайго, і пра мноства сыноў сваіх, і пра ўсё тое, як
узьвялічыў яго валадар і як узвысіў яго па-над князямі і слугамі валадарскімі.
12 І сказаў Аман: «Нават валадарка Эстэр акрамя мяне [нікога] ня клікала з валадаром на
гасьціну, якую яна прыгатавала; і таксама заўтра я пакліканы з валадаром да яе.
13 Але ўсё гэта не пакідае ў супакоі мяне ўвесь гэты час, пакуль я бачу Мардэхая Юдэя, які
сядзіць пры браме валадарскай».
14 І сказала яму Зэрэш, жонка ягоная, і ўсе сябры ягоныя: «Няхай падрыхтуюць дрэва высокае
ў пяцьдзясят локцяў, і раніцаю скажы валадару, і павесяць Мардэхая на ім, і пойдзеш на
гасьціну з валадаром вясёлым». І было добрым гэтае слова для Амана, і ён падрыхтаваў дрэва.

Эст 6

1 У тую ноч адыйшоў сон ад валадара, і ён сказаў, каб прынесьлі кнігу летапісу для памяці, і
чыталі яе перад валадаром.
2 І знайшлі запісанае пра тое, што паведаміў Мардэхай пра Бігтану і Тэрэша, двух эўнухаў
валадара, якія вартавалі парогі і якія намагаліся выцягнуць руку на валадара Ахашвэроша.
3 І сказаў валадар: «Якое ўшанаваньне і ўзьвялічваньне былі зроблены Мардэхаю за гэта?» І
сказалі юнакі валадара, якія служылі яму: «Ня зроблена яму анічога».
4 І сказаў валадар: «Хто на панадворку?» А Аман прыйшоў на вонкавы панадворак дому
валадара сказаць валадару, каб павесілі Мардэхая на дрэве, якое ён падрыхтаваў для яго.
5 І сказалі юнакі валадара яму: «Вось, Аман стаіць на панадворку». І сказаў валадар: «Няхай
ён увойдзе».
6 І ўвайшоў Аман. І сказаў яму валадар: «Што зрабіць таму чалавеку, якога валадар хоча
ўшанаваць?» І сказаў Аман у сэрцы сваім: «Каму жадае валадар зрабіць ушанаваньне больш,
чым мне?»
7 І сказаў Аман валадару: «Чалавеку, якога валадар хоча ўшанаваць,
8 няхай прынясуць шату валадарскую, у якую апранаецца валадар, і прывядуць каня, на якім
езьдзіць верхам валадар, і ўзложаць карону валадарства на галаву ягоную.
9 І няхай дадуць шаты і каня ў рукі аднаго з найзначнейшых князёў валадара, і апрануць таго
чалавека, якога валадар хоча ўшанаваць, і павядуць яго на кані на гарадзкую плошчу, і будуць
клікаць перад ім: “Гэтак робіцца таму чалавеку, якога валадар хоча ўшанаваць!”»
10 І сказаў валадар Аману: «Пасьпяшайся, вазьмі шату і каня, як ты сказаў, і зрабі гэта
Мардэхаю Юдэю, які сядзіць пры браме валадарскай. Не абміні анічога з таго, што ты сказаў».
11 І ўзяў Аман шату і каня, і апрануў Мардэхая, і вывеў яго на кані на гарадзкую плошчу, і
клікаў перад ім: «Гэтак робіцца таму чалавеку, якога валадар хоча ўшанаваць!»
12 І вярнуўся Мардэхай да брамы валадарскай, а Аман пасьпяшаўся ў дом свой у смутку і
закрыўшы галаву.
13 І распавёў Аман Зэрэш, жонцы сваёй, і ўсім сябрам сваім пра ўсё, што напаткала яго. І
сказалі яму мудрацы ягоныя і Зэрэш, жонка ягоная: «Калі з насеньня Юдэйскага Мардэхай,
перад абліччам якога ты пачаў падаць, ты не пераможаш яго, але падаючы, упадзеш перад
абліччам ягоным».
14 Калі яны яшчэ размаўлялі з ім, прыйшлі эўнухі валадарскія і прысьпешвалі, каб прывесьці
Амана на гасьціну, якую падрыхтавала Эстэр.

Эст 7

1 І прыйшоў валадар і Аман на гасьціну да валадаркі Эстэр.
2 І сказаў валадар Эстэр таксама ў другі дзень, выпіўшы віна: «Якое жаданьне тваё, валадарка
Эстэр? І будзе дадзена табе. І якая просьба твая? Нават палова валадарства, і будзе выканана».
3 І адказала валадарка Эстэр, і сказала: «Калі я знайшла ласку ў вачах тваіх, валадару, і калі
валадару гэта [падаецца] добрым, няхай будзе падаравана мне жыцьцё маё паводле жаданьня
майго і народ мой на просьбу маю!

4 Бо прададзены мы, я і народ мой, на вынішчэньне, забіцьцё і загубу. Калі б мы былі прададзены як нявольнікі і нявольніцы, я маўчала б, хоць прыгнятальнік не аднагародзіў бы шкоды валадару».
5 І адказаў валадар Ахашвэрош, і сказаў валадарцы Эстэр: «Хто гэта такі? І дзе той, які напоўніў сэрца сваё, каб зрабіць гэтак?»
6 І сказала Эстэр: «Прыгнятальнік і вораг — гэты нягодны Аман!» І Аман спалохаўся перад абліччам валадара і валадаркі.
7 І валадар устаў ад піцьця віна ў гневе сваім, і [пайшоў] у палацовы сад. А Аман стаў прасіць валадарку Эстэр за жыцьцё сваё, бо ён бачыў, што будзе канец ягоны ліхі ад валадара.
8 І валадар вярнуўся з палацовага саду ў дом, [дзе] піў віно, а Аман быў упаўшы да ложку, на якім была Эстэр. І сказаў валадар: «Ці яшчэ згвалціш валадарку ў прысутнасьці маёй у доме?» Слова выйшла з вуснаў валадара, і закрылі аблічча Аману.
9 І сказаў Харбона, адзін з эўнухаў, які перад абліччам валадара: «Вось дрэва, што паставіў Аман для Мардэхая, які рабіў добрае для валадара, стаіць каля дому Амана, вышынёю на пяцьдзясят локцяў». І сказаў валадар: «Павесьце яго на ім».
10 І павесілі Амана на дрэве, якое ён падрыхтаваў для Мардэхая. І гнеў валадара суцішыўся.

Эст 8

1 У той дзень валадар Ахашвэрош аддаў валадарцы Эстэр дом Амана, прыгнятальніка Юдэяў; а Мардэхай прыйшоў перад аблічча валадара, бо Эстэр паведаміла, хто ён для яе.
2 І зьняў валадар сыгнэт свой, які ён забраў у Амана, і аддаў яго Мардэхаю; і паставіла Эстэр Мардэхая над домам Амана.
3 І працягнула Эстэр, і гаварыла перад абліччам валадара, і ўпала ля ног ягоных, і плакала, і маліла яго, каб адвярнуў ліха Амана Агагяніна і намер ягоны, які ён надумаў супраць Юдэяў.
4 І выцягнуў валадар да Эстэр скіпетр залаты, і ўстала Эстэр, і стала перад абліччам валадара,
5 і сказала: «Калі добрым [падаецца] валадару, і калі я знайшла ласку перада абліччам ягоным, і адпаведная справа гэтая перад абліччам валадара, і калі я добрая ў вачах ягоных, няхай будзе напісана, каб былі вернуты лісты, прыдумка Амана, сына Гамэдата, Агагяніна, якія ён напісаў, каб выгубіць Юдэяў у-ва ўсіх акругах валадарскіх.
6 Бо як я магу глядзець на ліха, якое прыйдзе на народ мой, і як я магу глядзець на загубу родзічаў маіх?»
7 І сказаў валадар Ахашвэрош валадарцы Эстэр і Мардэхаю Юдэю: «Вось, дом Амана я аддаў Эстэр, і яго павесілі на дрэве за тое, што ён выцягнуў руку сваю на Юдэяў.
8 І вы напішыце пра Юдэяў, што добра ў вачах вашых, у імя валадара, і запячатайце сыгнэтам валадарскім; бо ліст, напісаны ў імя валадара і запячатаны сыгнэтам валадарскім, нельга зьмяніць».
9 І былі пакліканыя пісары валадарскія ў той час у трэці месяц, значыцца ў месяц Сіван, у дваццаць трэці дзень, і напісалі ўсё так, як загадаў Мардэхай, да Юдэяў і сатрапаў, і да ваяводаў, і князёў акругаў, якія ад Індыі аж да Куша, да ста дваццаці сямі акругаў, у кожную акругу пісьмом ейным і да кожнага народу моваю ягонаю, і да Юдэяў пісьмом іхнім і моваю іхняю.
10 І напісаў ён у імя валадара Ахашвэроша, і запячатаў сыгнэтам валадарскім, і паслаў лісты праз рукі ганцоў конных, якія езьдзяць на дрыгантах хуткіх і на мулах маладых,
11 пра тое, што валадар дазваляе Юдэям у кожным горадзе сабрацца і стаць на абарону жыцьця свайго, каб зьнішчыць, забіць і загубіць усіх ваяроў у народзе і ў акрузе, якія прыгнятаюць іх, дзяцей і жанчынаў, і маёмасьць іхнюю разрабаваць,
12 у адзін дзень у-ва ўсіх акругах валадара Ахашвэроша ў трынаццаты [дзень] дванаццатага месяца, значыць месяца Адар.
13 Водпіс пісаньня гэтага даецца як закон у акрузе і абвяшчаецца ўсім народам, і каб Юдэі былі гатовыя ў той дзень адпомсьціць ворагам сваім.
14 Ганцы, якія ехалі на дрыгантах хуткіх, выехалі, падганяныя і прысьпешваныя словам валадара. І закон быў абвешчаны ў Шушане сталіцы.

15 А Мардэхай выйшаў ад аблічча валадара ў шаце валадарскай, блакітнай і белай, і [на ім] —
вялікая залатая карона і плашч з вісону і пурпуру. І горад Шушан радаваўся і весяліўся.
16 У Юдэяў была яснасьць і радасьць, і вясёласьць, і ўшанаваньне.
17 І ў кожнай акрузе, і ў кожным горадзе на [ўсякім] месцы, куды прыйшло слова валадара і
загад ягоны, у Юдэяў была вясёласьць, і радасьць, і банкет, і сьвята. І шмат хто з народаў зямлі
сталі Юдэямі, бо страх перад Юдэямі ахапіў іх.

Эст 9

1 І ў дванаццаты месяц, значыцца месяц Адар, у трынаццаты дзень яго, калі прыйшоў час
споўніцца слову валадара і загаду ягонаму, у той дзень, калі ворагі Юдэяў спадзяваліся
запанаваць над імі, і зьмянілася ўсё, так што Юдэі запанавалі над ворагамі сваімі,
2 сабраліся Юдэі ў гарадах сваіх, у-ва ўсіх акругах валадара, каб узьняць руку на тых, якія
шукалі ім ліха; і ніхто ня стаў перад абліччам іхнім, бо страх перад імі ахапіў усе народы.
3 І ўсе князі акругаў і сатрапы, і ваяводы, і выканаўцы працаў валадарскіх падтрымлівалі
Юдэяў, бо ахапіў іх страх перад Мардэхаем.
4 Бо вялікі быў Мардэхай у доме валадара, і вестка пра яго разыходзілася ў-ва ўсе акругі, бо
чалавек гэты, Мардэхай, падымаўся і ўзьвялічваўся.
5 І білі Юдэі ўсіх ворагаў сваіх ударамі мяча, забіваючы і зьнішчаючы, і рабілі паводле жаданьня
свайго тым, што ненавідзелі іх.
6 У Шушане сталіцы забілі Юдэі і вынішчылі пяцьсот чалавек.
7 І Паршандату, Далфона, Аспату,
8 Парату, Адалію, Арыдату,
9 Пармашту, Арысая, Арыдая і Ваізату, —
10 дзесяць сыноў Амана, сына Гамэдата, прыгнятальніка Юдэяў, яны забілі, але на рабаваньне
ня выцягнулі рукі сваёй.
11 У той дзень дайшоў перад аблічча валадара лік забітых у Шушане сталіцы.
12 І сказаў валадар валадарцы Эстэр: «У Шушане сталіцы забілі Юдэі і выгубілі пяцьсот чалавек
і дзесяцёх сыноў Амана. А ў пазасталых акругах валадарскіх што яны зрабілі? Якое жаданьне
тваё? І яно будзе дадзена табе. І якая яшчэ просьба твая? І так станецца».
13 І сказала Эстэр: «Калі валадару [падаецца] добрым, няхай таксама дазволена будзе Юдэям,
якія ў Шушане, і заўтра рабіць паводле закону сёньняшняга дня. А дзесяцёх сыноў Амана
няхай павесяць на дрэве».
14 І сказаў валадар зрабіць гэтак, і быў абвешчаны закон у Шушане, і дзесяцёх сыноў Амана
павесілі.
15 І сабраліся Юдэі, якія ў Шушане, таксама ў чатырнаццаты дзень месяца Адар, і забілі ў
Шушане трыста чалавек, але на рабаваньне ня выцягнулі рукі сваёй.
16 А рэшта Юдэяў, якія [былі] ў акругах валадарскіх, сабраліся і сталі на [абарону] жыцьця
свайго, і супакоіліся ад ворагаў сваіх, і забілі тых, якія ненавідзелі іх, семдзясят тысячаў, але
на рабаваньне ня выцягнулі рукі сваёй.
17 [Так было] ў трынаццаты дзень месяца Адар; а ў чатырнаццаты [дзень] яны супакоіліся і
зрабілі яго днём частаваньня і радасьці.
18 А Юдэі, якія [былі] ў Шушане, сабраліся ў трынаццаты дзень яго і ў чатырнаццаты дзень яго;
а ў пятнаццаты дзень яго супакоіліся і зрабілі яго днём частаваньня і радасьці.
19 Дзеля гэтага Юдэі местачковыя, якія жывуць у гарадах неагароджаных, праводзяць
чатырнаццаты дзень месяца Адар у радасьці і частаваньнях, як дзень сьвяточны, пасылаючы
адны адным падарункі.
20 І апісаў Мардэхай гэтыя падзеі, і паслаў лісты да ўсіх Юдэяў, якія ў-ва ўсіх акругах валадара
Ахашвэроша, да блізкіх і да далёкіх,
21 Каб яны з'абавязаліся сьвяткаваць чатырнаццаты дзень месяца Адар і пятнаццаты дзень яго,
год у год,

22 як дні, у якія Юдэі супакоіліся ад ворагаў сваіх, і [як] той месяц, у які замяніўся для іх смутак
у радасьць, і жалоба — у дзень сьвяточны, каб яны зрабілі іх днямі частаваньня і радасьці,
пасылаючы адны адным падарункі і дары для бедных.
23 І прынялі Юдэі тое, што ўжо самі пачалі рабіць і пра што Мардэхай напісаў ім,
24 што Аман, сын Гамэдата, Агагянін, прыгнятальнік Юдэяў, думаў загубіць Юдэяў і кідаў пур,
значыцца жэрабя, каб расьцярушыць іх і загубіць іх,
25 і што [Эстэр] прыйшла перад аблічча валадара, і ён сказаў у лісьце, каб намер нягодны, які
[Аман] надумаў супраць Юдэяў, зьвярнуўся на галаву ягоную, і павесілі яго і сыноў ягоных на
дрэве.
26 Дзеля гэтага назвалі дні гэтыя Пурым, ад слова “пур”. Дзеля гэтага паводле ўсіх словаў лісту
гэтага і таго, што самі бачылі і што адбылося з імі,
27 пастанаўляючы, пастанавілі Юдэі і прынялі на сябе і на насеньне сваё, і на ўсіх, хто
далучыцца да іх, непарушна сьвяткаваць гэтыя два дні паводле напісанага пра іх і паводле
тэрміну іхняга, кожны год.
28 І дні гэтыя маюць узгадвацца і сьвяткавацца ў-ва ўсіх пакаленьнях, і ў кожнай сям’і, і ў
кожнай акрузе, і ў кожным горадзе. І дні гэтыя Пурыму не забудуцца сярод Юдэяў, памяць
пра іх ня зьнішчыцца ў насеньні іхнім.
29 І напісала Эстэр валадарка, дачка Абіхаіла, і Мардэхай Юдэй з усёю ўладаю, каб выконвалі
гэты другі ліст пра Пурым.
30 І паслалі лісты да ўсіх Юдэяў, у сто дваццаць сем акругаў валадарства Ахашвэроша са
словамі супакою і праўды,
31 каб прызначыць гэтыя дні Пурыму ў тэрмін іхні, які прызначыў ім Мардэхай Юдэй і Эстэр
валадарка, і як яны [самі] прызначылі сабе і насеньню свайму напамін посту і галашэньня
свайго.
32 І слова Эстэр зацьвердзіла гэты напамін пра Пурым, і было ўпісана ў кнігу.

Эст 10

1 І наклаў валадар Ахашвэрош падатак на зямлю і астравы марскія.
2 І ўсе дзеі ўлады ягонай і магутнасьці ягонай, і апісаньне велічы Мардэхая, якога ўзьвялічыў
валадар, вось, яны запісаныя ў Кнізе летапісу валадароў Мідзянаў і Пэрсаў.
3 Бо Мардэхай Юдэй [быў] другі пасьля валадара Ахашвэроша і вялікі ў Юдэяў, і [быў] ён
даспадобы мноству братоў сваіх, і шукаў дабра для народу свайго, і абвяшчаў супакой усяму
насеньню свайму.

КНІГА ЁВА

1 Чалавек на імя Ёў жыў у зямлі Уц, і быў ён чалавек шчыры і справядлівы, баяўся Бога і
пазьбягаў зла.
2 І нарадзілася яму сем сыноў і тры дачкі.
3 І была маёмасьць ягоная — сем тысячаў авечак, тры тысячы вярблюдаў, пяцьсот параў валоў,
пяцьсот асьліцаў і вельмі шмат слугаў. І быў чалавек той найбольшым сярод усіх сыноў
Усходу.
4 Сыны ягоныя зьбіраліся адзін у аднаго і банкетавалі ў доме кожнага па чарзе. І запрашалі
яны таксама тры сястры свае есьці і піць разам з імі.
5 Калі спыняліся чэргі баляваньня, Ёў пасылаў да іх, каб выканаць ачышчэньне іх. І ўставаў ён
раніцаю, і складаў ахвяры цэласпаленьня за кожнага з іх, бо казаў: «Можа, сыны мае нечым
саграшылі і зьняважылі Бога ў сэрцах сваіх?» Так рабіў Ёў у-ва ўсе дні.
6 Аднойчы, калі сыны Божыя прыйшлі стаць перад ГОСПАДАМ, між імі прыйшоў і шатан.
7 І сказаў ГОСПАД шатану: «Адкуль прыйшоў ты?» І адказаў шатан ГОСПАДУ, і сказаў: «Я
абыйшоў зямлю і хадзіў па ёй».
8 І сказаў ГОСПАД шатану: «Ці зьвярнуў ты ўвагу на слугу Майго, Ёва, якому няма подобнага
на зямлі. Ён — чалавек шчыры і справядлівы, баіцца Бога і пазьбягае зла».
9 І адказаў шатан ГОСПАДУ, і сказаў: «Ці ж Ёў задарма баіцца Бога?
10 Ці ж не атачыў Ты дабраславенствам Тваім і яго, і дом ягоны, і ўсю маёмасьць ягоную, і
працу рук ягоных, і ці не павялічваецца маёмасьць ягоная на зямлі?
11 Але выцягні крыху руку Тваю і дакраніся да ўсяго, што ён мае, зьневажвючы, будзе зьне-
важаць Цябе ў твар».
12 І сказаў ГОСПАД шатану: «Вось, усё, што ён мае, у руцэ тваёй, толькі яго самога не чапай».
І зыйшоў шатан ад аблічча ГОСПАДА.
13 І калі аднаго дня сыны і дочкі ягоныя елі і пілі віно ў доме найстарэйшага брата,
14 прыйшоў пасланец да Ёва і паведаміў: «Валы аралі, а асьліцы пасьвіліся побач,
15 і раптам напалі Савейцы, і пазабіралі іх, а слугаў пазабівалі мячом. Ацалеў толькі я адзін,
каб сказаць табе».
16 І калі ён яшчэ гаварыў, прыбег іншы і сказаў: «Агонь Божы зыйшоў з неба і папаліў авечак і
слугаў. Я адзін ацалеў, каб паведаміць табе пра гэта».
17 І калі ён яшчэ гаварыў, прыйшоў іншы і сказаў: «Халдэйцы сабралі тры дружыны, напалі на
вярблюдаў і пагналі іх, а слугаў мячом пазабівалі. Я адзін уцёк, каб паведаміць табе».
18 І калі ён яшчэ гаварыў, прыбег іншы і сказаў: «Калі сыны твае і дочкі елі і пілі віно ў доме
найстарэйшага брата свайго,
19 раптам паднялася страшэнная бура з пустыні, зрушыла чатыры вуглы дому, які ўпаў і
падушыў дзяцей тваіх, і яны памерлі. Ацалеў я адзін, каб паведаміць табе».
20 І ўстаў Ёў, і разьдзёр адзеньне сваё, і абгаліў галаву, і ўпаў на зямлю, і пакланіўся,
21 і сказаў: «Голы я выйшаў з улоньня маці маёй, і голы вярнуся туды. ГОСПАД даў, і ГОСПАД
забраў. Няхай будзе імя ГОСПАДА дабраслаўлёным!»
22 І ў-ва ўсім гэтым не саграшыў Ёў, і нічога неразважнага супраць Бога не сказаў.

Ёў 2

1 І сталася, што аднаго дня прыйшлі сыны Божыя стаць перад ГОСПАДАМ; між іх прыйшоў і
шатан, каб стаць перад Ім.
2 І сказаў ГОСПАД шатану: «Адкуль ты прыйшоў?» І адказаў шатан, і сказаў: «Я абыйшоў
зямлю і хадзіў па ёй».

3 І сказаў ГОСПАД шатану: «Ці зьвярнуў ты ўвагу на слугу Майго, Ёва, якому няма падобнага
на зямлі. Чалавек ён шчыры і справядлівы, баіцца Бога і пазьбягае зла, і захоўвае моцна
нявіннасьць сваю. А ты намаўляў Мяне супраць яго, каб Я зруйнаваў яго без прычыны».
4 І адказаў шатан ГОСПАДУ, і сказаў: «Скуру за скуру, а за жыцьцё сваё аддасць чалавек усё,
што мае.
5 Выцягні толькі руку Тваю і дакраніся да костак ягоных і цела ягонага, і, зьневажаючы, будзе
ён зьневажаць Цябе ў твар».
6 І сказаў ГОСПАД шатану: «Вось, ён у руцэ тваёй, толькі жыцьцё захавай яму».
7 І выйшаў шатан ад аблічча ГОСПАДА, і наслаў на Ёва ліхую праказу ад падэшвы нагі аж па
самы чуб ягоны.
8 І часаў [Ёў] сябе чарапком цэглы, седзячы ў гнаі.
9 І жонка ягоная сказала яму: «І ты дасюль трываеш у нявіннасьці сваёй? Пракляні Бога і
памірай».
10 А ён сказаў ёй: «Сказала ты, як адна з неразумных жанчынаў. Калі прыймаем усякае дабро
з рук Божых, чаму ня маем прыняць і зла?» І ў-ва ўсім гэтым не саграшыў Ёў вуснамі сваімі.
11 І пачулі тры сябры Ёва пра вялікае няшчасьце, якое напаткала яго, і прыйшлі, кожны з
мясцовасьці сваёй: Эліфаз з Тэману, Більдад з Шуаху і Цафар з Наамы. І дамовіліся яны, каб
разам прыйсьці, і наведаць яго, і пацешыць.
12 Але калі здалёк узьнялі яны вочы свае, не пазналі яго, і ўзьняўшы голас, плакалі, і разьдзёрлі
яны адзеньне сваё, і пасыпалі попелам галовы свае.
13 І сядзелі з ім на зямлі сем дзён і сем начэй, і ніхто з іх ня мог сказаць яму слова, бо бачылі,
што боль ягоны вельмі вялікі.

Ёў 3

1 Пасьля гэтага Ёў расчыніў вусны свае і наракаў на дзень свой.
2 І адказаў Ёў, і сказаў:
3 «Няхай прападзе дзень, у які я нарадзіўся, і ноч, у якую было сказана: “Зачаты хлопец”.
4 Няхай дзень той пераменіцца ў цемру; няхай ня рупіцца пра яго Бог з вышыні, і няхай ня
будзе ён асьветлены сьвятлом.
5 Няхай зацемняць яго цемра і цень сьмерці, няхай схавае яго змрок, і няхай напоўніцца ён
хмарамі.
6 Няхай ноч тую агарне цемра, няхай ня будзе яна ўлічана ў днях году, і няхай ня ўзгадваецца
ў ліку месяцаў.
7 Няхай тая ноч будзе бясплодная, і няхай радасьць да яе не завітае.
8 Няхай праклінаюць яе тыя, што дзень праклінаюць, што гатовыя абудзіць Левіятана.
9 Няхай сьцямнеюць зоркі сьвітаньня ейнага, каб чакала сьвятла і не дачакалася, і няхай ня
ўбачыць яна зараніцы новага дня,
10 бо яна не зачыніла ўлоньня, якое нарадзіла мяне, і не ўхіліла гора з вачэй маіх.
11 Чаму яшчэ ненароджаным, я не памёр? Чаму народжаны, не памёр раптам?
12 Навошта я быў прыняты каленямі? І навошта быў кормлены грудзьмі?
13 І цяпер спаў бы я моўчкі, і адпачываў бы ў-ва сьне сваім
14 з валадарамі і радцамі зямлі, якія пабудавалі сабе дамы магілы,
15 і з князямі, якія багатыя золатам і якія срэбрам вылажылі дамы свае.
16 І як спарон схаваны быў бы я, або як немаўля, што ня бачыла сьвятла.
17 Там злачынцы больш не шалеюць, а змораныя працай там адпачываюць.
18 Там усе вязьні жывуць бяз страху і ня чуюць крыку вартаўніка.
19 Там разам малы і вялікі, і слуга вольны ад пана свайго.
20 Навошта беднаму даецца сьвятло, і жыцьцё тым, што жывуць з горыччу душы,
21 якія чакаюць сьмерці і не дачакаюцца, і шукаюць яе больш, чым скарб,
22 і вельмі радуюцца і цешацца, калі знойдуць.
23 Якая радасьць чалавеку, перад якім шлях закрыты і якога Бог атачае цемраю?

24 Уздыханьні мае апярэджваюць хлеб мой, і скаргі мае ільюцца як вада.
25 Бо страх, якога я баяўся, прыйшоў да мяне, і тое, перад чым я дрыжэў, напаткала мяне.
26 Не супакойваўся я, не маўчаў і не адпачываў, але прыйшло да мяне няшчасьце».

Ёў 4

1 І адказаў Эліфаз з Тэману, і сказаў:
2 «Калі мы пачалі з табою размову, можа і прыкра табе гэта, але пачатую размову хто ж можа спыніць?
3 Вось, ты павучаў многіх і рукі самлелыя ўмацоўваў.
4 Словы твае ўмацоўвалі кволых і каленям дрыготкім надавалі сілы.
5 Цяпер кранула цябе цярпеньне вялікае, і ты аслабеў, кранула цябе яно, і ты ўстрывожыўся.
6 Ці ж страх твой [перад Богам] ня быў надзеяй тваёй, і дасканаласьць шляхоў тваіх ці ж не была спадзяваньнем тваім?
7 Прыгадай, ці загінуў хто нявінны, або ці былі зьнішчаны справядлівыя?
8 Часьцей бачыў я [зьнішчэньне] тых, што дапускаюцца злачынства і няпраўды, і самі яны зьбіраюць плады рук сваіх.
9 Ад гневу Божага яны гінуць, і ад полымя гневу Ягонага зьнікаюць.
10 Рыканьне ільва і голас ільвіцы сьціхае, зубы львянятаў крышацца.
11 Леў гіне з нястачы здабычы, малыя львяняткі разьбягаюцца.
12 І дайшло да мяне слова таемнае, і прыняло вуха маё шэпт ягоны.
13 У жаху відзежу начнога, калі звычайна людзей сон агартае,
14 ахапіў мяне страх і дрыжаньне, так што ўсе косткі мае трэсьліся.
15 Калі дух прайшоў перада мною, дыбарам сталі валасы на целе маім.
16 І стаў нехта, але я не пазнаў вобліку ягонага, постаць стала перад вачыма маімі, і пачуў я голас нібы лёгкага ветру:
17 “Ці чалавек больш праведны за Бога, або ці можа ён быць чысьцейшы за Творцу свайго?
18 Ён слугам Сваім не дае веры, і ў анёлах Сваіх знаходзіць правіннасьць.
19 Тым больш у тых, што жывуць у хатах гліняных, падмурак якіх — пясок, і нішчэюць яны, быццам моль.
20 Ад раніцы да вечара счэзнуць; ніхто імі не пацікавіцца, і прападуць вечна.
21 І ўсё астатняе будзе аднята ў іх, і памруць яны, бо ня маюць розуму”.

Ёў 5

1 Дык крычы, калі ёсьць той, хто адкажа табе? Да каго са сьвятых ты зьвернешся?
2 Бо неразумнага забівае гняўлівасьць, а дурнога губіць зайздрасьць.
3 Я бачыў, як дурны разжываецца, але ў момант спарахнеў дом ягоны.
4 Сыны ягоныя без ратунку, іх топчуць у браме, і няма каму ратаваць іх.
5 Ураджай ягоны зьесьць галодны, і з-за агароджы схопіць, і прагны праглыне багацьце ягонае.
6 Ня з пылу бярэцца няшчасьце, і не з зямлі расьце гора.
7 Але чалавек нараджаецца на пакуты, як зьнічкі — каб падымацца ўгору.
8 Таму я буду прасіць Бога, і да Бога ўзьнясу справу маю.
9 Ён творыць рэчы недасьледныя і вялікія, і цуды незьлічоныя.
10 Ён дае дождж на аблічча зямлі і поіць палеткі вадою.
11 Ён падымае прыніжаных высока, і тых, што смуткуюць, суцяшае збаўленьнем.
12 Ён разьбівае намеры ліхотнікаў, каб не змаглі рукі іхнія выканаць тое, што задумалі.
13 Ён ловіць хітрых у глупоце іхняй, і змову крывадушнікаў робіць марнай.
14 Удзень падаюць у цемру, і быццам уначы, навобмацак ідуць апоўдні.
15 Ён ратуе беднага ад мяча, і бедака — ад рукі нахабніка.
16 І ёсьць надзея для ўбогага, а крыўда зачыняе вусны свае.

17 Шчасьлівы чалавек, якога дакарае Бог; таму навучаньнем Усемагутнага не пагарджай.
18 Ён раніць, і Ён лечыць, Ён ударае і аздараўляе Сам рукамі Сваімі.
19 Ад шасьці бедаў збавіць цябе, і ў сёмы раз не кране няшчасьце цябе.
20 У голад Ён захавае цябе ад сьмерці, і ў час вайны ад мяча ўратуе.
21 Усьцеражэшся ты ад языка кусьлівага і ня будзеш баяцца спусташэньня, калі яно прыйдзе.
22 У час спусташэньня і голаду будзеш ты сьмяяцца і ня будзеш баяцца зьвяроў палявых.
23 З камянямі палявымі дамова твая, і зьвяры дзікія будуць прыязныя табе.
24 І ты даведаешся, што намёт твой у супакоі, і, наведваючы жытло тваё, ня знойдзеш нястачы.
25 І ты ўбачыш, што насеньне тваё шматлікае і нашчадкі твае — быццам трава на зямлі.
26 І ўвойдзеш у магілу ў гадах сьпелых, як кладзецца сноп пшаніцы ў час свой.
27 Як мы дасьледавалі гэта, так і ёсьць. Паслухай гэта, і сам зразумееш».

Ёў 6

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «О, каб было ўзята на вагу гора маё, і разам з ім былі ўзважаны пакуты мае!
3 Цяпер вось яно цяжэйшае за пясок марскі, таму неразважныя словы мае.
4 Бо стрэлы Усемагутнага ў-ва мне, і атруту іхнюю п’е дух мой, і страхі Божыя ваююць супраць мяне.
5 Ці будзе раўсьці асёл, маючы траву? Або ці будзе рыкаць вол, стоячы пры поўным жолабе?
6 Ці ж нехта будзе есьці нясмачнае, якое не пасолена? Або ці можа смакаваць бялок яечны?
7 Тое, чаго раней не хацела дакрануцца душа мая, цяпер у хваробе сталася ежай для мяне.
8 Хто зробіць, каб споўнілася жаданьне маё, і тое, чаго чакаю, ці дасьць мне Бог?
9 Няхай Бог раструшчыць мяне, няхай працягне руку Сваю і зьнішчыць мяне!
10 Няхай будзе гэта пацехай маёй, і я буду радавацца ў мучэньнях маіх, бо не пагардзіў словамі Сьвятога.
11 Якая сіла мая, каб вытрываць усё гэта? Або які канец мой, каб цярпліва перанесьці ўсё гэта.
12 Ці цьвёрдасьць камяня — гэта сіла мая? Або ці цела маё з медзі?
13 Ці я маю дапамогу для сябе і ці ёсьць для мяне ратунак?
14 Хто ня зьявіць сябру свайму міласэрнасьць? Хіба той, хто не баіцца Усемагутнага?
15 Браты мае здрадзілі мяне, як рэчышчы ручаёў, якія зьнікаюць.
16 Яны чарнеюць ад лёду, калі спадзе на іх сьнег,
17 а ў час, калі сушыць, яны высыхаюць, і ў сьпякоту зьнікаюць з месца свайго.
18 І зводзяць яны падарожнікаў са шляхоў іхніх, і тых, што вандруюць праз пустыню, губяць.
19 Падарожныя з Тэмы шукаюць праходу да іх, і вандроўнікі з Шэвы ўскладаюць надзею на іх,
20 і расчароўваюцца ў спадзяваньні сваім, прыйшлі туды і набраліся сораму.
21 Такія і вы для мяне цяпер: убачылі няшчасьце маё і напоўніліся страхам.
22 Ці ж я прасіў вас: “Прынясіце мне штосьці, і з маёмасьці вашай падаруйце мне.
23 Вызваліце мяне з рукі ворага і вырвіце мяне з рукі прыгнятальніка”?
24 Навучыце мяне, а я памаўчу, і калі я заблукаў, растлумачце мне.
25 Якія балючыя словы праўды! Але што даводзяць дакараньні вашыя?
26 Вы прыдумляеце словы на абвінавачваньне, але на вецер пускаеце словы вашыя.
27 На сірату вы нападаеце і робіце шкоду сябру вашаму.
28 Цяпер, прашу, паслухайце мяне, бо на вачах вашых не скажу няпраўды.
29 Паверце, няма тут падману! Паверце, я трымаюся праведнасьці сваёй.
30 Ці гавару я няпраўду? Ці паднябеньне маё ня цяміць, што ёсьць ліхотай?

Ёў 7

1 Ці ж ня [службай] вайсковай ёсьць жыцьцё чалавечае на зямлі, і дні ягоныя — як дні парабка?
2 Як нявольнік шукае ценю і як найміт чакае платы сваёй,

3 так і я меў месяцы мучэньняў і лічыў цяжкія ночы свае.
4 Калі я кладуся, думаю: “Калі ўстану?” І доўжыцца вечар, і, поўны болю, я чакаю сьвітаньня.
5 Цела маё пакрыта гнільлём і брудам, скура мая лопаецца і цячэ гноем.
6 Дні мае праходзяць хутчэй, чым чаўнок ткацкі, і мінаюць без надзеі.
7 Памятай, што жыцьцё маё — як подых ветру, і вока маё ня вернецца, каб пабачыць дабро.
8 І ня ўгледзіць мяне вока чалавека, вочы Твае глянуць на мяне, а мяне ўжо няма.
9 Як воблака пралятае і чэзьне, так і той, хто зыходзіць у цемру, не вяртаецца.
10 Ён не вяртаецца болей у дом свой, і месца ягонае болей не дачакаецца яго.
11 Таму не шкадую я вуснаў маіх, і буду гаварыць у трывозе духа майго, буду жаліцца ў горычы душы маёй.
12 Ці ж я — мора, або пачвара марская, што Ты паставіў пры мне варту?
13 Калі я думаю сабе: “Няхай пацешыць мяне ложак мой і супакоіць жаль мой”,
14 Ты палохаеш мяне снамі і відзежамі наводзіш страх.
15 Дзеля гэтага душа мая чакае спыненьня дыханьня, а косткі мае хочуць сьмерці.
16 Я страціў надзею, ня буду больш жыць; даруй мне, бо дні мае — марнасьць.
17 Хто ёсьць чалавек, што Ты ўслаўляеш яго, што Ты схіляеш сэрца Тваё да яго?
18 Ты наведваеш яго на сьвітаньні, і штохвіліну выспрабоўваеш яго.
19 Калі Ты ўжо адвернеш вочы Твае ад мяне? Чаму не дазваляеш мне праглынуць сьліну маю?
20 Саграшыў я, дык што маю зрабіць Табе, бо Ты дасьледуеш чалавека? Чаму зрабіў Ты, што я зрабіўся ворагам для Цябе, і сам сабе стаўся невыносным?
21 Чаму Ты не прабачыш грэху майго і чаму не адкінеш віны маёй? Бо хутка я засну ў парахне, і калі раніцаю будзеш шукаць мяне, ня знойдзеш».

Ёў 8

1 І адказаў Більдад з Шуаху, і сказаў:
2 «Як доўга ты будзеш так гаварыць? Словы вуснаў тваіх — як вецер гвалтоўны.
3 Ці ж Бог перакручвае суд? Ці Усемагутны перакручвае праведнасьць?
4 Калі сыны твае саграшылі супраць Яго, дык Ён аддаў іх у рукі злачыннасьці іхняй.
5 Аднак, калі ты на сьвітаньні зьвернешся да Бога і будзеш маліць Усемагутнага,
6 і калі будзеш чысты і праведны, Ён сустрэне цябе і дасьць табе супакой паводле праведнасьці тваёй.
7 І хоць былі малыя пачаткі твае, канец твой будзе вельмі вялікі.
8 Распытай пакаленьні даўнейшыя і зваж на досьвед бацькоў тваіх,
9 бо мы — учора [нарадзіліся] і мала ведаем, бо дні нашыя на зямлі — быццам цень.
10 А яны навучаць цябе, і скажуць табе, і ад сэрца свайго скажуць слова табе.
11 Ці ж можа расьці трысьнёг бяз вільгаці, або чарот без вады?
12 Ён яшчэ квітнее і не сарваныя рукой кветкі ягоныя, але ён сохне раней за ўсю траву.
13 Такі шлях усіх, якія забываюцца пра Бога, і надзея бязбожнага загіне.
14 Надзея яго ценькая, як нітка, пэўнасьць ягоная — як павуціньне.
15 Абапрэцца ён на дом свой, але той не ўстаіць, схопіцца за яго, але ён не ўтрымаецца.
16 Зелянее ён на сонцы і выпускае галінкі свае,
17 і ў купу камянёў запускаюцца карані ягоныя, і паміж камянёў ён вырас.
18 А калі вырвуць яго з месца ягонага, адрачэцца яно ад яго: “Ня ведаю я цябе”.
19 Такая вось радасьць шляху ягонага, а з пылу вырастаюць іншыя.
20 Бог не адкіне нявіннага і ня дасьць рукі ліхотнікам.
21 Ён напоўніць вусны твае сьмехам, і губы твае — радасным ускліканьнем.
22 Тыя, што ненавідзяць цябе, асаромяцца, і не ўстаіць намёт бязбожных».

Ёў 9

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Сапраўды, ведаю, што так ёсьць, але як апраўдаецца чалавек перад Богам?
3 Калі хто захоча спрачацца з Ім, Ён не адкажа яму нават на адно пытаньне з тысячы.
4 Ён — мудры розумам і магутны сілаю. Хто супрацівіцца Яму і застанецца цэлым?
5 Ён пераносіць горы, і ня ведаюць яны, што Ён пераварочвае іх у гневе Сваім.
6 Ён зрушвае зямлю з месца ейнага, і падваліны яе трасуцца.
7 Ён загадвае сонцу, і тое не ўзыходзіць, і на зоркі накладае пячатку.
8 Ён Сам расьцягвае нябёсы і крочыць па хвалях марскіх.
9 Ён стварыў Воз, Касцоў, Стажар'е і зоркі паўднёвая.
10 Ён творыць вялікія і недасьледныя рэчы і цуды, якіх ніхто палічыць ня можа.
11 Калі Ён прыйдзе да мяне, я ня ўбачу Яго, а калі Ён адыйдзе, не заўважу.
12 Калі Ён раптам схопіць, хто Яму перашкодзіць? Або хто зможа сказаць: "Што Ты робіш?"
13 Бог ня стрымлівае гневу Свайго, перад ім схіляюцца служкі Рагава.
14 Дык хто я такі, каб адказваць Яму і гаварыць з Ім падабранымі словамі?
15 Хоць бы я быў праведны, ня буду адказваць, буду толькі маліць Судзьдзю свайго.
16 Калі буду клікаць, і Ён адкажа, не паверу, што Ён выслухаў голас мой.
17 Ён можа зьнішчыць ураганам мяне, і павялічыць раны мае без прычыны.
18 Ён ня дасьць супакою душы маёй, і напоўніць мяне бядотамі.
19 Што да сілы, дык Ён мацнейшы, што да суду, дык хто зможа Яго вінаваціць?
20 Калі б я хацеў сябе апраўдаць, вусны мае асудзяць мяне. І калі б я выявіўся нявінным, Ён прызнае мяне вінаватым.
21 Калі б я быў невінаваты, гэтага ня хоча ведаць душа мая, і я асуджу жыцьцё сваё.
22 Усё адно, кажу я, і невінаватага, і грэшнага Ён зьнішчыць разам.
23 Калі раптоўна некага біч [сьмерці] забівае, з бяды нявінных Ён насьміхаецца.
24 Зямля аддадзена ў рукі бязбожных, аблічча судзьдзяў яе Ён закрывае. Калі ня Ён гэта, дык хто?
25 Дні мае хутчэйшыя за бегуна, уцяклі і ня бачылі дабра,
26 праляцелі, як чаўны з чароту, і як арол, які імкне за здабычай.
27 Калі я скажу: "Забудуся пра смутак свой, зьмяню аблічча сваё і стану я вясёлы"
28 дык дрыжу дзеля ўсіх пакутаў маіх, ведаючы, што Ты не апраўдаеш мяне.
29 Калі я такі грэшны, навошта дарма мучуся?
30 Калі б я памыўся ў вадзе са сьнегу і лугам абмыў рукі свае,
31 і тады Ты ўвапхнеш мяне ў балота, і будзе брыдзіцца мною адзеньне маё.
32 Бо Ён — не чалавек, падобны да мяне, каб я мог адказаць Яму. Ён — не чалавек, з якім мне разам ісьці на суд.
33 Няма між намі пасярэдніка, які паклаў бы руку на абодвух.
34 Няхай Ён забярэ ад мяне біч Свой, і страх Ягоны няхай не палохае мяне.
35 І тады я буду гаварыць, і ня буду баяцца Яго, бо так я ня маю адвагі.

Ёў 10

1 Абрыдла мне жыцьцё маё, стану я наракаць на сябе і гаварыць у горычы душы маёй!
2 Скажу я Богу: "Не асуджай мяне, а пакажы мне, за што Ты мяне так судзіш?
3 Ці добрым Табе здаецца тое, што Ты прыгнятаеш і ганьбіш твор рук Тваіх, а радзе бязбожных спрыяеш?
4 Ці Ты маеш вочы цялесныя, або як чалавек бачыць, так і Ты бачыш?
5 Ці ж дні Твае — як дні чалавечыя, і гады Твае — як гады чалавека,
6 што Ты шукаеш няправеднасьць маю і даведваешся грахі мае.

7 Хоць Ты ведаеш, што я нічога благога не зрабіў, але няма нікога, хто б з рукі Тваёй мог
выцягнуць мяне.
8 Рукі Твае зрабілі мяне і ўфармавалі мяне, але Ты раптам губіш мяне.
9 Памятай, прашу, што Ты з гліны зрабіў мяне. Чаму зноў у парахно мяне вяртаеш?
10 Ты выліў мяне як малако, і як сыр, зьляпіў мяне.
11 У скуру і цела Ты апрануў мяне, зьвязаў мяне косткамі і жыламі,
12 абдарыў мяне жыцьцём і любоўю, і апека Твая сьцерагла дух мой.
13 Хоць гэта хаваў Ты ў сэрцы Тваім, аднак я ведаю, што яно было ў душы Тваёй.
14 Калі б я саграшыў, Ты б убачыў, і не пакінуў бы грэху майго без пакараньня.
15 Гора мне, калі б я стаўся ліхім, але хоць бы і быў праведны, дык і тады не падыму галавы,
насычаны зьдзекамі і горам.
16 Калі я падымуся, Ты, як леў, ловіш мяне, і зноў паказваеш мне веліч Тваю.
17 Ты ставіш сьведкаў Тваіх супраць мяне і павялічваеш гнеў Твой на мяне, і кары Твае будуць
спадаць на мяне.
18 Навошта выводзіў Ты з улоньня мяне? Лепш бы я памёр, калі яшчэ ніводнае вока ня бачыла
мяне!
19 Няхай бы я быццам ня быў, і з улоньня пайшоў бы ў магілу.
20 Ці ж не кароткія дні жыцьця майго? Дык прабач Ты мяне, каб крыху прасьвятлела аблічча
маё,
21 пакуль я пайду, і не вярнуся, у зямлю цемры і ценю сьмерці,
22 у зямлю начнога змроку і ценю сьмерці, дзе бязладзьдзе і сьвятло нібы ноч”».

Ёў 11

1 І адказаў Цафар з Наамы, і сказаў:
2 «Ці ж таму, хто шмат гаворыць, нельга адказаць, або ці чалавек гаваркі апраўдаецца?
3 Ці ж пустая гаворка твая прымусіць людзей маўчаць, і ня будзе каму асароміць цябе?
4 Бо ты сказаў: “Слушная рада мая, і чысты я ў вачах Тваіх”.
5 Але калі б Бог прамовіў слова, і адкрыў вусны Свае да цябе,
6 і адкрыў табе таямніцы мудрасьці, што вышэй за ўсякае разуменьне! І ты даведаешся, што
Бог забыўся пра беззаконьні твае.
7 Ці можаш ты сьцяміць глыбіні Божыя, і ці можаш дайсьці да межаў Усемагутнага?
8 Бо Ён — вышэйшы за неба, і што ты зробіш? Ён — глыбейшы за пекла, і як ты нешта будзеш
ведаць?
9 Даўжэйшая за зямлю мерка Ягоная і шырэйшая за мора.
10 Калі Ён праходзіць, хто Яго спыніць? Калі ставіць на суд, хто запярэчыць Яму?
11 Бо Ён ведае марнасьць чалавечую і бачыць злачынствы, і ўсё заўважае.
12 І чалавек пусты стане разважлівым, хоць і нараджаецца ён, як асёл дзікі.
13 Калі ты ўмацуеш сэрца тваё і да Яго ўзьнясеш рукі твае,
14 калі беззаконьне, што ў руцэ тваёй, ты адкінеш і ня будзе месца няпраўдзе ў намёце тваім,
15 тады ты падымеш аблічча тваё без правіны, і будзеш моцны, і ня будзеш баяцца.
16 Бо ты забудзешся на гора тваё, і ўзгадаеш пра яго, як пра дождж, што мінуў.
17 І жыцьцё тваё будзе як сьвятло апоўдні, і цемра заясьнее, як сьвітаньне.
18 І будзеш ты пэўны, бо маеш надзею, і глянеш наўкола, і будзеш спаць спакойна.
19 Будзеш адпачываць, і ніхто ня будзе палохаць цябе, і многія будуць шукаць аблічча твайго.
20 А вочы бязбожных сасьлепнуць, і ня будуць яны мець прытулку, і надзея іхняя — стогн
душы».

Ёў 12

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Сапраўды, вы — толькі людзі, і з вамі памрэ мудрасьць вашая.

3 І я маю розум, як вы, і нічым я ад вас ня горшы. І хто ня ведае пра гэта?
4 Насьмешкай я стаўся для сяброў маіх, што я клічу Бога, каб Ён выслухаў мяне. Сьмешная праведнасьць нявіннага [чалавека].
5 Пагарджаюць няшчасьцем тыя, што жывуць у супакоі, яны гатовыя папхнуць таго, у каго ногі хістаюцца.
6 Спакойныя намёты рабаўнікоў, і бясьпечныя тыя, што гнявяць Бога, іх быццам Бог вядзе за руку.
7 Запытайся жывёлу, і тая навучыць цябе, і птушак нябесных, і яны скажуць табе.
8 Запытайся зямлі, і яна патлумачыць табе, і раскажуць табе рыбы марскія.
9 Хто з іх усіх ня ведае, што рука ГОСПАДА ўчыніла ўсё гэта?
10 У руцэ Ягонай душа ўсяго жывога, і дух усякага цела чалавечага Ён трымае.
11 Ці ж ня вуха разумее словы, і ці ж не паднябеньне пазнае смак ежы?
12 Старыя маюць мудрасьць, а хто жыве доўга — разуменьне.
13 У [Бога] — мудрасьць і сіла, Ён мае раду і разуменьне.
14 Вось, Ён зруйнуе, і ніхто не адбудуе, Ён увязьніць чалавека, і нельга вызваліць.
15 Вось, Ён спыняе воды, і яны высыхаюць, а калі Ён пусьціць іх, яны зямлю спустошаць.
16 У Яго — моц і цьвярозы розум, Ён [ведае] падманутага і ашуканца.
17 Ён робіць босымі дарадцаў і ў судзьдзяў адбірае разум.
18 Ён разьвязвае ярмо валадароў і вяроўкай абвязвае сьцёгны іхнія.
19 Ён робіць босымі сьвятароў і магнатаў скідае.
20 Ён закрывае вусны верных і старых пазбаўляе разважлівасьці.
21 Ён вылівае пагарду на шляхетных, аслабляе пояс адважных.
22 Ён выяўляе тое, што схаванае ў цемры, і ўсё цёмнае асьвятляе.
23 Ён народ узьвялічвае і нішчыць, пашырае народы і губіць.
24 Ён забірае розум у начальнікаў народаў зямлі, і дае ім блукаць па пустых бездарожжах.
25 Яны ходзяць навобмацак у цемры, і сьвятла ня маюць, і хістаюцца яны, як п'яныя.

Ёў 13

1 Усё гэта бачыла вока маё, і чула вуха маё, і ўсё зразумела.
2 Тое, што вам вядома, і я ведаю, і я ня горшы ад вас.
3 Я хачу гаварыць з Усемагутным і прагну Богу прадставіць [справу маю].
4 Бо вы задумалі няпраўду, вы — лекары, нічога ня вартыя.
5 Калі б вы маўчалі, вы зьявілі б гэтым мудрасьць!
6 Паслухайце скаргу маю і зважце на адказ вуснаў маіх.
7 Ці належала вам дзеля Бога казаць няпраўду і дзеля Яго гаварыць хлусьліва?
8 Ці належала вам быць крывадушнымі дзеля Яго, і за Бога на судзе спрачацца?
9 Ці добра будзе, калі Ён вас будзе выспрабоўваць? Ці зможаце з Яго насьміхацца, як насьміхаюцца з чалавека?
10 Ён, караючы, пакарае вас, калі будзеце патаемна зважаць на аблічча.
11 Няўжо веліч Ягоная не палохае вас, і страх Ягоны не агартае вас?
12 Напаміны вашыя — гэта словы з попелу, а вежы вашыя — вежы гліняныя.
13 Памаўчыце крыху, а я буду гаварыць, і няхай што заўгодна прыйдзе на мяне.
14 Навошта мне кусаць цела маё зубамі маімі і душу маю трымаць рукамі маімі.
15 Хоць бы і забіў мяне [Бог], буду мець у Ім надзею і буду абараняць шляхі мае перад абліччам Ягоным.
16 У гэтым будзе збаўленьне маё, бо ніводзін бязбожнік ня прыйдзе перад аблічча Ягонае.
17 Слухайце ўважліва словы мае, і няхай будзе ў вушах вашых тлумачэньне маё.
18 Бо я пачаў суд, і ведаю, што [буду] апраўданы.
19 Хто будзе судзіцца са мной? Тады я змоўкну, і [гатовы] памерці.
20 Дзьвюх толькі рэчаў не рабі са мною, і тады я ня буду хавацца ад аблічча Твайго:

21 аддалі руку Тваю ад мяне, і жах Твой няхай не палохае мяне.
22 Пакліч мяне, і я адкажу Табе, або я буду гаварыць, а Ты адкажы мне.
23 Якія грахі і правіны я маю? Пакажы мне грэх мой і правіны мае.
24 Чаму Ты хаваеш аблічча Тваё і лічыш мяне за ворага для Цябе?
25 Ці Ты пужаеш лісток, які [ветрам] сарваны, і гонішся за сухой саломай?
26 Бо Ты пішаш пра мяне прыкрасьці і прыгадваеш мне грахі маладосьці маёй.
27 Ты замыкаеш у калоду ногі мае, і пільна назіраеш сьцежкі мае, і дасьледуеш усе сьляды мае.
28 І я марнею, як спарахнелае дрэва і як адзеньне, якое моль патачыла.

Ёў 14

1 Чалавек, які народжаны з жанчыны, мае век кароткі і поўны трывогаў.
2 Вырастае кветка, і вяне, і мінае, як цень, і не застаецца.
3 І Ты на такога зьвяртаеш вочы Твае і вядзеш яго на суд з Сабою.
4 Хто ж можа нячыстага зрабіць чыстым? Хіба ніхто!
5 Калі дні яму вызначаны, і лік месяцаў ягоных вядомы Табе, і Ты вызначыў яму межы, якіх нельга яму перайсьці,
6 дык адвярні вочы Твае ад яго, няхай ён супачыне, няхай пацешыцца днём, як той найміт.
7 Бо нават дрэва мае надзею. Калі яно было сьсечанае, дык зноў адрасьце, і парасткі свае пускаць не пакіне,
8 і калі састарэе ў зямлі корань ягоны, і пень ягоны ў пяску спарахнее,
9 ад вільгаці вады яно зазелянее і пусьціць галінкі як маладая расьліна.
10 А чалавек калі памрэ, ён адыйшоў, і дзе знойдзеш яго?
11 Зьнікаюць воды з мора, і рэкі высыхаюць да дна.
12 Так і чалавек, калі засьне, не прачнецца, пакуль неба ня счэзьне; ня ўстане, і зо сну свайго не прачнецца.
13 О, каб Ты схаваў мяне ў адхлані і захаваў мяне, пакуль не міне ярасьць Твая, і вызначыў мне час, у які зноў мяне ўзгадаеш.
14 Ці памёршы чалавек зноў будзе жыць? Усе дні службы маёй я чакаю, калі прыйдзе замена мая.
15 Ты паклічаш, і я адкажу Табе, Ты засумуеш за творам рук Тваіх.
16 Бо Ты палічыш нават крокі мае, і будзеш ласкавы адносна грахоў маіх.
17 Ты запячатаеш, як у мяшку, злачынствы мае, і выбеліш правіны мае.
18 Але як гара, падаючы, развальваецца, і як скала зыходзіць з месца свайго,
19 і як вада сьцірае камень, і як плынь падмывае глебу, так і Ты нішчыш надзею ў чалавеку.
20 Ты сьціскаеш яго, і ён адыходзіць у вечнасьць, зьмяняеш аблічча ягонае і адсылаеш яго.
21 Ці ў славе жывуць дзеці ягоныя, ён ня ведае, ці ў ганьбе, ён не разумее.
22 Адчувае ён боль цела свайго, і душа ягоная ў ім самім ные».

Ёў 15

1 І адказаў Эліфаз з Тэману, і сказаў:
2 «Ці ж будзе мудры адказваць на словы пустыя, і ці напоўніць жывот свой ветрам палючым?
3 Ці будзе спрачацца словамі пустымі і словамі, якія нічым не дапамогуць?
4 Ты адкідаеш страх Божы і аслабляеш малітву да Бога.
5 Вусны твае гавораць паводле сапсутасьці тваёй, і ты карыстаешся мовай хітруноў.
6 Асуджаюць цябе вусны твае, але ня я, і губы твае сьведчаць супраць цябе.
7 Ці ты — першы чалавек, які нарадзіўся, і ці ты створаны раней за ўзгоркі?
8 Ці ты слухаў на нарадзе з Богам і ўзяў сабе мудрасьць?
9 Ці ты нешта ведаеш, чаго мы ня ведаем? Або нешта разумееш, чаго мы не разумеем?
10 Паміж нас ёсьць і старыя, і сівыя, старэйшыя, чым дні бацькі твайго.
11 Ці табе мала пацяшэньня Божага і лагоднага слова, якое табе сказанае?

12 Чаму так абураецца сэрца тваё, і чаму так ганарліва глядзяць вочы твае,
13 што ты гневаешся на Бога і вырываюцца такія словы з вуснаў тваіх?
14 Хто такі чалавек, каб быць яму беззаганным? І ці можа быць праведным народжаны жанчынаю?
15 Ён сьвятым Сваім не давярае, і нябёсы нячыстыя ў вачах Ягоных.
16 Тым больш брыдкі і сапсуты чалавек, які, як ваду, п'е ліхоту.
17 Паслухай мяне, і я распавяду табе, і тое, што бачыў, раскажу табе,
18 што мудрыя чулі і ня ўтойвалі гэтага бацькі іхнія.
19 Ім толькі была дадзена зямля, і паміж іх не хадзіў чужынец.
20 Бязбожнік мучыцца праз усё жыцьцё сваё, і няпэўны лік гадоў злачынцы.
21 Ён заўсёды чуе крык жахлівы вушамі сваімі, і калі падаецца, што ўсё спакойна, на яго нападае нішчыцель.
22 Ён ня верыць, што можа вырвацца з цемры, яму прызначана ад мяча загінуць.
23 Ён бадзяецца, [шукаючы] хлеба, і дзе ён? І ён ведае, што падрыхтаваны для яго дзень цемры.
24 Палохае яго бяда, і мучэньне на яго нападае, як валадар, падрыхтаваны да бою.
25 Выцягвае ён руку сваю на Бога і хоча працівіцца Усемагутнаму,
26 і бяжыць на Яго з выцягнутай шыяй пад заслонай тоўстага шчыта.
27 Ён пакрыў твар свой тлушчам сваім, а з бакоў ягоных сала зьвісае.
28 Ён жыве ў гарадах апусьцелых, і ў дамах неабжытых, даведзеных да заняпаду.
29 Ён ня будзе багаты, і не захаваецца маёмасьць ягоная, і на зямлі ён не запусьціць каранёў.
30 Ня выберацца ён з цемры, і сьпёка спаліць парасткі ягоныя, і вецер абаб'е першацьвет ягоны.
31 Няхай ня верыць марнасьці ашуканы, бо марнасьць будзе ўзнагародай ягонай.
32 Перш, чым спыняцца дні ягоныя, ён зьвяне, і галіны ягоныя не зазелянеюць.
33 Скіне ён, як вінаградная лаза, недасьпелыя гронкі, і, як аліўка, страсе кветкі свае.
34 Грамада бязбожніка будзе бясплоднай, агонь спаліць намёты хабарнікаў.
35 Бо ён зачаў ліхоту і нарадзіў марнасьць, і нутро ягонае падман рыхтуе».

Ёў 16

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Часта я чуў такія рэчы! Усе вы — марныя пацяшыцелі.
3 Ня маюць канца пустыя словы, і што змусіла цябе так адказваць?
4 І я падобна як вы гаварыў бы, калі б было ў душы вашай тое, што ў маёй. І вёў бы я пра вас гаворку, і ківаў бы на вас галавой сваёй,
5 і падбадзёрваў бы вас вуснамі сваімі, і ня стрымліваў бы губы свае.
6 Калі буду гаварыць, не суцішу болю майго, і калі замаўчу, не адыйдзе ён ад мяне.
7 Цяпер замучыў мяне боль мой, спустошыў усю грамаду маю.
8 Зморшчкі мае сьведчаць супраць мяне, паўстае слабасьць мая супраць мяне, дакараючы мяне.
9 Гнеў ягоны разрывае і б'е мяне, скрыгоча зубамі сваімі на мяне. Вораг мой утаропіў вочы свае на мяне.
10 Яны разьзявілі на мяне пашчы свае, і, лаючыся, б'юць мяне па твары, і зьбіраюцца разам супраць мяне.
11 Аддаў мяне Бог злачынцы, у рукі ліхадзеяў выдаў мяне.
12 Я быў спакойны, але Ён устрос мяне, схапіў мяне за шыю і раструшчыў мяне, і зрабіў мяне як цэль для Сябе.
13 Акружылі мяне лучнікі Ягоныя, Ён разрывае ныркі мае і, не шкадуючы, жоўць маю выліў на зямлю.
14 Ён робіць у-ва мне вылом за выломам, бяжыць на мяне, як волат.
15 Зрэбніцу апрануў я на скуру маю і схіліў да зямлі галаву маю.
16 Твар мой пачырванеў ад плачу, вочы мае агарнуў цень сьмяротны,
17 хоць рукі мае ня сквапныя, і чыстая малітва мая.

18 О, зямля! Не закрый крыві маёй, і няхай лямант мой не замаўчыць у табе.
19 Бо вось, цяпер у небе Сьведка мой, і Заступнік мой — на вышынях.
20 Насьміхаюцца нада мною бліжнія мае, да Бога ліе сьлёзы вока маё.
21 О, каб чалавек мог судзіцца з Богам, як судзіцца сын чалавечы з бліжнім сваім,
22 бо мінуць палічаныя гады, і я пайду шляхам, з якога няма вяртаньня.

Ёў 17

1 Дух мой зламаны, дні мае спыняюцца, [застаецца] мне [толькі] магіла.
2 Насьмешкі навокал мяне, і ў горычы чэзьне вока маё.
3 Ты Сам дай заклад за мяне, бо хто ж паручыцца за мяне, ударaючы руку маю?
4 Бо Ты закрыў сэрца іхняе на разуменьне, дзеля таго яны не ўзьнімуцца.
5 Хто бліжніх сваіх робіць здабычай, у сыноў ягоных вочы сьцямнеюць.
6 Ён паставіў мяне ў прымаўку народу, і ў твар плююць мне.
7 Сасьлепла ад горычы вока маё, і члены цела майго сталіся нібы цень.
8 Праведнікі аслупянелі, бачачы гэтае, і нявінны злуецца на бязбожніка.
9 Аднак праведнік будзе трымацца шляху свайго, і чысты дадасьць моцы рукам сваім.
10 Дык апамятайцеся ўсе вы, і прыходзьце, але я не знаходжу між вамі нікога разумнага.
11 Дні мае прамінулі, пагубіліся думкі мае, летуценьні сэрца майго.
12 А яны ноч замяняюць на дзень, і да цемры сьвятло набліжаюць.
13 Ці магу спадзявацца, што адхлань будзе домам маім і ў цемры я пасьцялю ложак сабе?
14 Кажу дамавіне: “Ты — бацька мой!” А чарвякам: “Маці мая і сястра мая”.
15 Дык дзе ж тады надзея мая? І хто можа бачыць надзею маю?
16 У брамы адхлані зыйдзе яна, і разам са мною ў парахне супачыне».

Ёў 18

1 І адказаў Більдад з Шуаху, і сказаў:
2 «Калі пакінеце вы кідаць прамовы? Перш зразумейце, а потым будзем гаварыць.
3 Чаму ты нас лічыш за жывёлу, і мы нячыстыя ў вачах тваіх?
4 Што ты губіш душу тваю ў гневе тваім? Ці ж дзеля цябе апусьцее зямля, і з месца свайго зварухнецца скала?
5 Бо сьвятло бязбожніка патухне, і не застанецца зьнічкі ад агню ягонага.
6 Пацямнее сьвятло ў намёце ягоным, і сьветач, які ў ім, патухне.
7 Звузяцца крокі моцы ягонай, намер ягоны здрадзіць яго.
8 Ублуталіся ў сетку ногі ягоныя, і ходзіць ён паміж пастак.
9 Пятля зловіць нагу ягоную, і пастка сашчэпіцца над ім.
10 Схаваны на зямлі пасткі для яго, і сіло чакае яго на дарозе.
11 Палохаюць яго жахі і аблутваюць ногі ягоныя.
12 Зьнікае ад голаду дужасьць ягоная, і загуба падрыхтаваная рэбрам ягоным.
13 Хвароба зьесьць скуру ягоную, і зжарэ часткі цела ягонага першародны сьмерці.
14 Зьнікне надзея ягоная з намёту яго, і пагоняць яго да валадара жахаў.
15 Будзе ён жыць у намёце, але не ў сваім, і жытло ягонае будзе пасыпана серкаю.
16 Зьнізу падсечаны карані ягоныя, а зьверху вянуць галінкі ягоныя.
17 Памяць пра яго зьнікне з зямлі, і ня будзе слаўлена імя ягонае на плошчах.
18 Прагоняць яго са сьвятла ў цемру, і ўвесь сьвет будзе гнаць яго.
19 Ня будзе ані сына, ані ўнука ў народзе ягоным, і нікога не застанецца ў месцы вандраваньня ягонага.
20 У дзень ягоны аслупянеюць нашчадкі, і сучаснікаў ахопіць жудасьць.
21 Такое вось жытло грэшніка, і такое месца таго, хто ня ведае Бога».

Ёў 19

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Дакуль будзеце вы зьдзеквацца з душы маёй і мучыць мяне словамі сваімі?
3 Ужо дзесяць разоў вы абражалі мяне і не саромеецеся зьневажаць мяне.
4 Калі я сапраўды саграшыў, грэх мой застанецца са мною.
5 Калі ж вы хочаце ўзьвялічыцца нада мною і ўпікнуць мяне брыдотамі маімі,
6 дык, прынамсі, цяпер зразумейце, што Бог пакараў мяне і сецьцю Сваёй аблытаў мяне.
7 Хоць я крычу: “Гвалт!”, мяне ня чуюць, лямантую, але няма суду.
8 Ён загарадзіў шлях мне, і я не магу прайсьці, і шлях мой цемраю ахутаў.
9 Ён сьцягнуў з мяне славу маю і забраў карону з галавы маёй.
10 Ён нішчыць мяне адусюль, і я гіну, і Ён зваліў, як дрэва, надзею маю.
11 Ён загневаўся на мяне ў ярасьці Сваёй, і залічыў мяне за ворага Свайго.
12 І прыйшлі разам дружыны Ягоныя, і рыхтуюць валы супраць мяне, і акружылі аблогаю намёт мой.
13 Адвярнуў Ён братоў маіх ад мяне, і знаёмыя мае, быццам чужыя, адыйшліся ад мяне.
14 Пакінулі мяне сваякі мае, і тыя, што ведалі мяне, забыліся пра мяне.
15 Хатнія ў доме маім і служкі мае за чужога ўважаюць мяне, і быццам чужынец стаўся я ў вачах іхніх.
16 Паклікаў я слугу свайго, а ён не паслухаў мяне, хоць вуснамі сваімі ўпрошваю яго.
17 Дыханьне маё абрыдла жонцы маёй, і сьмярдзючы я для дзяцей улоньня яе.
18 Пагарджаюць мною дзеці малыя, і, калі я ўстаю, яны зьдзекуюцца з мяне.
19 Брыдзяцца мною ўсе найбліжэйшыя сябры мае, і тыя, каго я найболей любіў, адвярнуліся ад мяне.
20 Да скуры маёй і да цела майго прысохлі косткі мае, засталіся толькі дзясны каля зубоў маіх.
21 Зьлітуйцеся нада мною, зьлітуйцеся нада мною, сябры мае! Бо рука Божая дакранулася да мяне.
22 Чаму вы як Бог перасьледуеце мяне і зьдзекуецеся над целам маім?
23 Хто запіша словы мае? Хто дасьць мне, каб былі яны зазначаныя ў кнізе,
24 разцом жалезным на волаве, або высечаны на скале?
25 Я ведаю, што Абаронца мой жывы, і што ў апошні дзень Ён стане над парахном маім,
26 і хоць зьнішчана скура мая, у целе маім я ўбачу Бога.
27 Я сам убачу Яго, і вочы мае, а ня іншага, будуць аглядаць Яго. Прагнуць [гэтага] ныркі мае ў нутры маім.
28 Вы ня кажаце: “Навошта мы перасьледуем яго?”, нібыта корань справы знойдзены ў-ва мне.
29 Дык бойцеся мяча, бо гнеў супраць грэху — гэты меч, і ведайце, што ёсьць суд».

Ёў 20

1 І адказаў Цафар з Наамы, і сказаў:
2 «Вось, разважаньні мае прынукаюць адказваць, і неспакой у-ва мне.
3 Упіканьне, якім мяне зьневажаў, я выслухаў, і дух розуму майго паказвае мне.
4 Ці ня ведаеш ты, што ад пачатку, як нарадзіўся чалавек на зямлі,
5 радасьць злачынцаў кароткая, і пацеха бязбожных на момант толькі.
6 Калі пыха ягоная падымецца да неба, і галава ягоная дакранецца хмараў,
7 як гной прападзе ён, і тыя, што бачылі яго, спытаюцца: “Дзе ён?”
8 Як сон прамінае ён, і не знайсьці, пралятае, быццам марыва начное.
9 Вока, якое бачыла яго, ужо ня ўбачыць яго, і месца ягонае ня ўбачыць яго болей.
10 Сыны ягоныя прасіць будуць ласкі ва ўбогіх, і рукі ягоныя аддадуць маёмасьць сваю.
11 Косткі ягоныя, поўныя сілы маладосьці, разам з ім будуць спаць у парахне.
12 Калі салодкае ў вуснах ягоных зло, схаванае пад языком ягоным,
13 і будзе ён шкадаваць яго, і ня кіне яго, але будзе трымаць у вуснах сваіх,

14 тады хлеб у жываце ягоным пераменіцца ў жоўць зьмяіную.
15 Багацьці, якія ён праглынуў, вырыгае, выцягне іх Бог з жывата ягонага.
16 Праглыне ён атруту зьмяіную, і заб'е яго язык гадзюкі.
17 Ня ўбачыць ён ручаёў алею, рэк, якія мёдам і малаком ацякаюць.
18 І верне ён здабытак з чужой працы, і не праглыне яго, і ня будзе цешыцца з багацьцяў набытых.
19 Бо ён крыўдзіў і не зважаў на ўбогіх, рабаваў дамы, якія не будаваў.
20 Ніколі не наядаўся жывот ягоны, і ніколі ня мог ён дагадзіць прагавітасьці сваёй.
21 Нічога не заставалася з-за абжорства ягонага, і таму не застанецца нічога з маёмасьці ягонай.
22 Калі наесца, цесна яму будзе, і ўсякая бяда будзе нападаць на яго.
23 Калі будзе напаўняць жывот свой, Бог спашле на яго ярасьць гневу Свайго, і вылье на яго кару Сваю.
24 Будзе ён уцякаць ад зброі жалезнай, і патрапіць пад лук мядзяны.
25 Страла паб'е цела ягонае і пячонку ягоную, і нахлынуць на яго рэчы страшныя.
26 Цемра захаваная для яго, і будзе паліць яго агонь, які ніхто не разьдзьмухвае, і тое, што засталося ў намёце ягоным, будзе зьнішчана.
27 Нябёсы аб'явяць бязбожнасьць ягоную, і зямля паўстане супраць яго.
28 Будзе зьнішчаны ўраджай дому ягонага, і разальецца ў дзень гневу Божага.
29 Такая доля перад Богам чалавека бязбожнага і спадчына, прызначаная для яго Богам».

Ёў 21

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Паслухайце ўважліва словы мае, і няхай будуць яны на пацяшэньне вашае.
3 Дазвольце, і я буду казаць, а пасьля словаў маіх сьмейцеся сабе.
4 Ці ж я гавару супраць чалавека, і ці ж няслушна маю быць нецярплівы?
5 Паглядзіце на мяне і аслупянейце, і ўдарце рукою ў вусны свае.
6 Калі я ўзгадваю гэта, я палохаюся, і дрыжаньне калоціць цела маё.
7 Чаму жывуць бязбожнікі, дажываюць да старасьці, і багацеюць?
8 Насеньне іхняе моцнае ў іх, і ўнукі іхнія гадуюцца на вачах іхніх.
9 Дамы ў іх забясьпечаныя ад страху, і няма кары Божай над імі.
10 Бугай у іх заўсёды плодны і не зьнемагае, і карова целіцца, і не скідае [цяляці].
11 Дзеці іхнія, як статак, выходзяць, і малыя іхнія гуляюць вакол іх.
12 Яны сьпяваюць пад бубны і гусьлі і весяляцца пры гуках жалейкі,
13 і праводзяць у радасьці дні свае, і спакойна зыходзяць у адхлань.
14 Яны кажуць Богу: "Адыйдзіся ад нас! Ня хочам ведаць шляхоў Тваіх.
15 Хто такі Усемагутны, каб служыць Яму, і што Ён нам дапаможа, калі будзем маліць Яго?"
16 Маюць яны ў руках сваіх дабрабыт, хоць думкі іхнія далёка ад Яго.
17 Як часта тухне лямпа бязбожнікаў і нахлынае на іх загуба? Ці [часта] ў гневе [Божым] прыходзяць на іх пакуты?
18 Ці яны падобныя да мякіны на ветры і да попелу гарачага, які вецер разносіць?
19 [Скажаш:] "Бог захоўвае для дзяцей ягоных кару Сваю". Няхай аднагародзіць Ён яму, каб ён ведаў.
20 Няхай убачаць вочы ягоныя загубу яго, і няхай нап'ецца ён гневу Усемагутнага.
21 Бо які будзе клопат яму пра дом ягоны, калі лік месяцаў ягоных спыніцца?
22 Ці ж можа хто вучыць веданьню Бога? А Ён судзіць найвышэйшых.
23 Адзін памірае ў сіле і здаровы, багаты і ў супакоі.
24 Начыньні ягоныя поўныя малака, і косткі ягоныя напоўнены сьвежым шпікам.
25 А іншы памірае ў горычы душы і ня цешыўся дабром.
26 Аднак разам будуць яны спаць у парахне, і абодвух апануюць чэрві.

27 Вось, я ведаю думкі вашыя і намеры вашыя, каб нашкодзіць.
28 Бо вы кажаце: “Дзе дом шляхетнага, а дзе намёт бязбожніка?”
29 Ці вы не пыталіся некага з падарожнікаў і словаў іхніх вы не зразумелі,
30 што ліхотнік захаваны ў дзень загубы і збаўлены ў дзень гневу?
31 Хто будзе дакараць яго за шляхі ягоныя? І за тое, што ён зрабіў, хто аднагародзіць яму?
32 Яго прынясуць да магілы, і пра дамавіну ягоную задбаюць.
33 Салодкімі яму будуць груды зямлі, бо за ім ідуць усе людзі, і перад ім — безьліч.
34 Дык чаму ж вы надарма пацяшаеце, калі ў адказе вашым адзін падман?»

Ёў 22

1 І адказаў Эліфаз з Тэману, і сказаў:
2 «Ці можа чалавек быць карысным Богу? Разумны ледзь самаму сабе можа быць карысным.
3 Што за карысьць Усемагутнаму, калі ты праведны, або што Яму дасьць, калі шлях твой беззаганны?
4 Ці ж за пабожнасьць тваю Ён карае цябе і ідзе на суд з табою?
5 Ці ж не за ліхоту тваю і незьлічоныя злачынствы твае?
6 Бо ты браў заклад ад братоў тваіх ні за што і з голых зьдзіраў адзеньне.
7 Ты не даваў вады сасьмягламу, і галоднаму адмаўляўся даваць хлеба.
8 Моцнаму чалавеку даваў ты зямлю, і заможны пасяляўся на ёй,
9 а ўдоваў адсылаў ты з пустымі рукамі, і сіротаў абцяжарваў работамі.
10 Дзеля таго акружаны ты пасткамі, і трывожыць цябе страх неспадзяваны,
11 і ў цемры ты ня бачыш, і вада вялікая залівае цябе.
12 Ці ж Бог не вышэйшы за неба? Паглядзі ўгару на зоркі, як яны высока!
13 А ты кажаш: “Што ведае Бог? Ці праз імглу Ён можа судзіць?
14 Хмары — заслона Яму, так што ня бачыць Ён і ходзіць па скляпеньні нябесным”.
15 Ці ты будзеш трымацца сьцежкі старадаўняй, па якой хадзілі злачынцы,
16 якія заўчасна былі зьнішчаныя, бо паводка падмыла падваліны іхнія?
17 Яны казалі Богу: “Адыйдзіся ад нас! Што можа зрабіць нам Усемагутны?”
18 А Ён багацьцем напоўніў дамы іхнія. Але няхай будзе далёкая ад мяне рада бязбожных.
19 Праведнікі будуць бачыць гэта і цешыцца, і чалавек нявінны будзе сьмяяцца з іх:
20 “Сапраўды вынішчаны супраціўнік наш, а багацьце іхняе спаліў агонь”.
21 Дык пагадзіся з Ім, і мей супакой, і праз гэта прыйдзе да цябе добрае.
22 Вазьмі з вуснаў Ягоных закон і палажы словы Ягоныя ў сэрцы тваім.
23 Калі навернешся да Усемагутнага, адновішся і адкінеш злачыннасьць ад намёту твайго,
24 калі ацэніш золата як парахно, а [золата] Афіру — як камень з ручая,
25 тады Усемагутны будзе золатам тваім і бліскучым срэбрам для цябе.
26 Тады захапляцца ты будзеш Усемагутным і падымеш да Бога аблічча тваё.
27 Будзеш прасіць Яго, і Ён выслухае цябе, і ты споўніш абяцаньні твае.
28 Што пастановіш, прыйдзе да цябе, і на шляхах тваіх будзе сьвяціць сьвятло.
29 Бо Ён паніжае таго, хто пыхлівы, а хто схіляе вочы, той будзе збаўлены.
30 Ён ратуе [нават] таго, хто не без віны, і будзе ён уратаваны дзеля чыстасьці рук сваіх».

Ёў 23

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «І сёньня з горыччу жальба мая, бо рука Ягоная цяжэйшая за стагнаньне маё.
3 О, каб я ведаў, дзе знайсьці Яго, я пайшоў бы да месца жытла Ягонага!
4 Я б прынёс перад аблічча Ягонае справу маю і напоўніў бы вусны мае нараканьнямі.
5 І ведаў бы я словы, якімі Ён адкажа, і зразумеў бы, што Ён будзе казаць мне.
6 Ці з вялікім запалам Ён будзе спрачацца са мною? Не! Ён толькі зьверне ўвагу на мяне!

7 Там справядлівы прадставіць справу сваю перад Ім, і ад Судзьдзі майго выйду я вольным.
8 Але вось, я іду на ўсход, і няма Яго, і іду на захад, і не знаходжу Яго.
9 На поўначы шукаю Яго, і ня бачу, і паварочваю на поўдзень, і не заўважаю.
10 А Ён ведае шлях мой, і няхай выспрабуе мяне, выйду я [чысты], як золата.
11 Нага мая трымалася сьлядоў Ягоных, я пільнаваў шляхі Ягоныя і не зыходзіў з іх.
12 Ад загадаў вуснаў Ягоных не адступаюся, і захоўваю словы вуснаў Ягоных як пастанову.
13 Ён адзін [вырашае], і хто заверне Яго? І што захоча душа Ягоная, Ён зробіць.
14 Бо Ён зробіць, што прызначыў пра мяне, і шмат такога ёсьць у Яго.
15 Таму я дрыжу перад абліччам Ягоным, разважаю [пра Яго], і ў страху вялікім перад Ім.
16 Бог аслабіў сэрца маё, і Усемагутны настрашыў мяне.
17 Бо не ад цемры я гіну, і аблічча маё не пакрытае змрокам.

Ёў 24

1 Чаму ня вызначаны час [суду] Усемагутнага, і тыя, што ведаюць Яго, ня бачаць дзён Ягоных?
2 [Бязбожнікі] межы пераносяць, рабуюць статкі і пасьвяць іх,
3 асла ў сіротаў адбіраюць, бяруць у заклад вала ў удавы,
4 убогіх спіхваюць з дарогі, і ўсе прыгнечаныя зямлі змушаныя хавацца.
5 Вось, як аслы ў пустыні, выходзяць [небаракі] на працу сваю, шукаючы хлеб для дзяцей у стэпе.
6 Жнуць яны траву на полі і зьбіраюць вінаград у бязбожнага,
7 начуюць голыя, без адзеньня, і ня маюць чым накрыцца ў холад,
8 мокнуць у гарах ад дажджоў, і, ня маючы прытулку, туляцца да скалаў.
9 Адрываюць сіротаў ад грудзей, і ад убогіх бяруць заклад.
10 Голыя ходзяць яны, без адзеньня, і галодныя носяць снапы.
11 У мурах выціскаюць алей, і ціснуць віно ў тоўчні, і смагнуць.
12 У гарадах, паміраючы, стогнуць; душа калечаных крычыць, але Бог не зважае на зло.
13 Яны бунтуюцца супраць сьвятла, і ня ведаюць шляхоў Ягоных, і не сядзяць на сьцежках Ягоных.
14 На сьвітаньні ўстае забойца, забівае ён беднага і ўбогага, і ноччу ходзіць як злодзей.
15 Вока чужаложніка чакае цемры, кажучы: “Ня ўбачыць мяне вока”, і хавае твар свой за заслонай.
16 У поцемках падкопваюцца пад дамы, а днём замыкаюцца, і ня ведаюць яны сьвятла.
17 Бо раніца для іх усіх — цень сьмерці; бо ведаюць яны жудасьці цемры.
18 Лёгкі ён на абліччы вады, і праклятая доля ягоная на зямлі, і ня вернецца ён на шлях да вінаградніку.
19 Суш і сьпякота высушылі воды сьнегавыя, і гэткая адхлань для тых, што саграшылі.
20 Няхай забудзецца пра яго ўлоньне [маці], і няхай смакуюць цела ягонае чэрві, няхай не застаецца памяці пра яго, але як дрэва няхай зломіцца беззаконьнік.
21 Ён пасьвіцца з бясплоднай, якая не нараджала, і ўдаве ня робіць дабра.
22 Ён здужвае сілай сваёю магутных, ён устае, і [ніхто] ня мае пэўнасьці ў жыцьці сваім.
23 [Бог] дае яму месца бясьпекі, і ён на гэта абапёрся, але вочы Ягоныя — на шляхах іхніх.
24 Падняліся яны трохі, і няма іх, і паніжаны, і прападаюць, і зрэзаныя яны як каласы.
25 Калі гэта ня так, хто зможа мяне аспрэчыць і марнотай палічыць словы мае?»

Ёў 25

1 І адказаў Більдад з Шуаху, і сказаў:
2 «Панаваньне і страх у Яго. Ён творыць супакой на вышынях Сваіх!
3 Ці ёсьць лік войску Ягонаму? І над кім не ўзыходзіць сьвятло Ягонае?
4 Ці можа чалавек быць праведным перад Богам, і як можа быць чыстым народжаны ад жанчыны?

5 Вось, нават месяц ня сьветлы, і зоркі нячыстыя ў вачах Ягоных.
6 Тым больш чалавек — гнілізна, і сын чалавечы — чарвяк».

Ёў 26

1 І адказаў Ёў, і сказаў:
2 «Як ты дапамог кволаму, і як падтрымаў рамяно бясьсільнае!
3 Якую ты даў параду нямудраму і выявіў цьвярозы розум для многіх!
4 Каго ты навучыў словам сваім, і які дух выходзіць з цябе?
5 Рэфаімы дрыжаць пад водамі, і тыя, што жывуць разам з імі.
6 Адхлань адкрытая перад Ім, і няма заслоны для Абадону.
7 Ён расьцягнуў поўнач над пусткаю і павесіў зямлю на нічым.
8 Ён укладае воды ў аблокі Свае, і хмары ня рвуцца ад іх [цяжару].
9 Ён закрывае поўню месяца і расьцягнуў над ім хмару Сваю.
10 Ён пазначыў мяжу на абліччы вады, аж да мяжы між сьвятлом і цемраю.
11 Слупы нябесныя дрыжаць і баяцца гневу Ягонага.
12 Магутнасьцю Сваёю Ён супакойвае мора, і мудрасьцю Сваёй Ён зьнішчыў Рагава.
13 Дух Ягоны распагоджвае неба, і рука Ягоная нішчыць зьмея, які ўцякае.
14 Вось такія канцы шляхоў Ягоных; і толькі слабыя словы мы чуем пра Яго. Хто можа зразумець грымоты велічы Ягонай?»

Ёў 27

1 І працягваў Ёў прамову сваю, і сказаў:
2 «На жыцьцё Бога, Які адкінуў суд мой, і на Усемагутнага, Які да горычы давёў душу маю,
3 пакуль яшчэ трывае дыханьне ў-ва мне, і пакуль Дух Божы ў ноздрах маіх,
4 ня скажуць вусны мае няпраўды, і язык мой ня будзе гаварыць хлусьні.
5 Далёкі я ад таго, каб лічыць вас праведнымі. Пакуль не памру, не адступлюся ад нявіннасьці маёй.
6 У праведнасьці маёй буду трымацца моцна і не адкіну яе, ня будзе дакараць сэрца маё дзён [жыцьця] майго.
7 Няхай будзе як бязбожнік вораг мой, і той, хто паўстае супраць мяне — як злачынца.
8 Якая надзея крывадушніка, калі ён будзе адсечаны, калі Бог забярэ душу ягоную.
9 Ці выслухае Бог крык ягоны, калі прыйдзе да яго бяда?
10 Ці зможа ён цешыцца Усемагутным і клікаць Бога ўвесь час?
11 Я навучу вас пра руку Божую, нічога не схаваю пра Усемагутнага.
12 Вось, вы ўсё гэта бачылі, дык навошта пустая гаворка?
13 Такая вось доля чалавека ліхога і спадчына крыўдзіцеля, якую атрымаюць яны ад Усемагутнага.
14 Калі памножацца сыны ягоныя, упадуць ад мяча, і нашчадкі ягоныя не насыцяцца хлебам.
15 Хто застанецца ад іх, тых зьнішчыць зараза, і ўдовы ягоныя ня будуць плакаць.
16 Калі назьбірае ён срэбра, як пяску, і нарыхтуе адзеньня, як гліны,
17 ён, прыгатуе, але апранецца праведнік, і срэбра падзеліць нявінны.
18 Пабудаваў ён, як павук, дом сабе, і як вартаўнік зрабіў сабе будан.
19 Багатым кладзецца спаць, і такім не ўстае, расплюшчыць вочы свае — і няма нічога.
20 Ахопяць яго жахі, як паводка, і ўначы схопіць яго бура.
21 Падхопіць яго вецер усходні і панясе, і віхура адарве яго ад месца ягонага.
22 Ён кіне яго і не пашкадуе, хоць будзе ўцякаць з рукі Ягонай.
23 Будуць пляскаць над ім рукамі сваімі і засьвішчуць над ім на кожным месцы.

Ёў 28

1 Сапраўды, срэбра мае пачаткі жылаў, і ёсьць месца для золата, дзе яго ачышчаюць.
2 Жалеза здабываецца з парахна, і з каменя топіцца медзь.
3 [Чалавек] паставіў мяжу цемры, і дасьледуе ўсё да краю, і [шукае] камяні ў цемры і ценю сьмерці.
4 Капаюць капальні там, дзе не хадзілі ногі, зыходзяць у глыбіню, вісяць і хістаюцца далёка ад людзей.
5 Зямля, з якой хлеб вырастае, у глыбіні перавернута, як агнём.
6 Камяні ейныя — месца шафіра, і пясок золата ў ёй.
7 Драпежная птушка ня ведае сьцежкі [туды], і ня бачыць яе вока арла.
8 Не тапталі яе сыны пыхлівасьці, і не праходзіў па ёй леў.
9 Выцягвае [чалавек] руку сваю на крэмень, і пераварочвае горы да падножжа.
10 У скалах высякае каналы, і ўсё каштоўнае бачыць вока ягонае.
11 І спыняе ён цячэньне рэк, і скарбы выдабывае на сьвятло.
12 Але дзе знаходзіцца мудрасьць, і дзе месца розуму?
13 Чалавек ня ведае туды дарогі і не знаходзіць яе на зямлі жывых.
14 Бездань кажа: “Няма яе ў-ва мне”, і мора кажа: “Няма яе ў-ва мне”.
15 Не даецца яна за золата і не здабываецца яна за вагу срэбра.
16 Ня плаціцца за яе ані золатам Афіру, ані каштоўным оніксам або шафірам.
17 Не раўняецца да яе золата і шкло, не замяніць яе на посуд залаты.
18 Каралі і крышталь ня ўзгадваюцца [пры ёй]; цана мудрасьці — большая за пэрлы.
19 Ня варты яе тапаз з Кушу, і золатам чыстым не ацэніш яе.
20 Адкуль паходзіць мудрасьць, і дзе месца розуму?
21 Схаваная яна ад вачэй усіх жывых, птушкам нябесным невядомая.
22 Абадон і сьмерць кажуць: “Вушамі нашымі мы чулі пра славу яе”.
23 Бог разумее шлях яе, і Ён ведае месца ейнае.
24 Бо Ён разглядае краі зямлі, і бачыць усё, што пад небам.
25 Калі даваў Ён сілу ветру і ўсталёўваў водам берагі,
26 калі даваў закон дажджам, і шлях грымоту і маланцы,
27 тады бачыў Ён яе, і выявіў, і ўмацаваў яе, і дасьледаваў яе.
28 І сказаў Ён чалавеку: “Страх перад Госпадам — гэта мудрасьць; а пазьбягаць зла — розум”».

Ёў 29

1 І працягваў Ёў прамову сваю, і сказаў:
2 «Хто мне дасьць, каб я быў як у часы старадаўнія, у тыя дні, калі Бог захоўваў мяне,
3 калі сьветач Ягоны сьвяціў над галавой маёй, калі ў сьвятле Ягоным хадзіў я ў цемры,
4 калі яшчэ жыў у днях восені маёй, калі спагаднасьць Бога была ў намёце маім,
5 калі Усемагутны быў са мною і вакол мяне — дзеці мае,
6 калі сьцежкі мае купаліся ў масьле, і са скалы ручаём сьцякаў алей.
7 Калі я выходзіў да брамы гораду, і на плошчы ставіў сядзеньне маё,
8 убачыўшы мяне, юнакі хаваліся, а старыя ўставалі і стаялі,
9 князі пераставалі гаварыць і клалі палец на вусны свае,
10 начальнікі спынялі голас свой, і язык іхні прыліпаў да паднябеньня.
11 Вуха, якое чула мяне, добра гаварыла пра мяне, і вока, якое бачыла, сьведчыла пра мяне,
12 бо я вызваляў гаротніка, які клікаў [мяне], і сірату, і бездапаможнага.
13 Дабраславенства таго, які гінуў, зыходзіла на мяне, і сэрца ўдавы я рабіў радасным.
14 Я апранаўся ў праведнасьць, і быў апрануты; як плашч і карона быў суд мой.
15 Вокам быў я для сьляпога, і нагой — для кульгавага.
16 Бацькам быў для ўбогіх, і ў справе, якой ня ведаў, пільна разьбіраўся.

17 Я разьдзіраў пашчу крыўдзіцелю і вырываў з зубоў ягоных нарабаванае.
18 Я гаварыў у душы: “У гнязьдзе сваім я памру і, як пясок, памножу дні свае.
19 Корань мой адкрыты для вады, і раса пакрывае галіны мае.
20 Слава мая заўсёды аднаўляецца, і лук у руцэ маёй абнаўляе [сілу]”.
21 Тыя, што слухалі мяне, чакалі, і маўчалі, [чуючы] параду маю.
22 Да словаў маіх ня мелі нічога дадаць, і мова мая на іх сплывала.
23 І чакалі мяне, як дажджу, і адкрывалі вусны свае, як на дождж вясновы.
24 Калі ўсміхаўся я да іх, ня верылі, і сьвятла аблічча майго не адкідалі.
25 Я выбіраў шлях да іх, і сядзеў на чале, і быў, як валадар у атачэньні войска; як той, хто пацяшае засмучаных.

Ёў 30

1 А цяпер сьмяюцца з мяне маладзейшыя за мяне днямі, бацькоў якіх я грэбаваў пакласьці разам з сабакамі пры авечках маіх.
2 Бо сіла рук іхніх мне была не патрэбная. Поўня сілы іх мінула.
3 З бяды і з голаду яны зьнемагліся, і жывіліся ў [зямлі] бясплоднай, зруйнаванай і спустошанай.
4 Зьбіралі лебяду і хмызьнякі, і корань ядлоўца быў хлебам іхнім.
5 Спасярод сябе іх выкідалі і крычалі на іх, як на злодзеяў.
6 І жылі яны ў сухіх ярах, у ямах зямлі і ў скалах.
7 Раўлі яны ў хмызьняках і зьбіраліся пад цернямі,
8 сыны неразумных і сыны без імя, выгнаныя з зямлі.
9 А цяпер стаўся я для іх насьмешкай і зрабіўся ім у прыказку.
10 Яны брыдзяцца мяне і ўцякаюць далёка ад мяне, і не саромеюцца пляваць мне ў твар,
11 бо Ён разьвязаў пояс мой, і ўдарыў мяне, і яны скінулі вузду [з сябе] перад абліччам маім.
12 Праваруч паўстаюць падшыванцы і падстаўляюць нагу мне, і накіроўваюць на мяне сьцежкі загубы сваёй.
13 Папсулі яны дарогі мае, карыстаюцца з пакутаў маіх, і ня трэба ім дапамога.
14 Як праз вылом муру напалі яны на мяне, і спад руінаў выскокваюць.
15 Жахі агарнулі мяне; як вецер зьнікла веліч мая, і збаўленьне маё, як хмара, праляцела.
16 І цяпер выліваецца з мяне душа мая, і дні гора нахлынулі на мяне.
17 Ноччу [боль] пранізвае косткі мае, і тыя, што ядуць мяне, ня сьпяць.
18 Моцна прыстала да мяне адзеньне маё, і прыліпла сукня мая да мяне.
19 Ён кінуў мяне ў балота, і я стаўся падобны да пылу і попелу.
20 Я клічу Цябе, але Ты не адказваеш мне; стаю, але Ты не глядзіш на мяне.
21 Ты стаўся бязьлітасным для мяне і з моцаю бічуеш мяне рукою Тваёй.
22 Ты падняў мяне і пусьціў на вецер, і спустошыў мяне.
23 Ведаю, што Ты на сьмерць вядзеш мяне, і ў дом, дзе зьбярэцца ўсё жывое.
24 Хіба не працягвае рукі зруйнаваны? Ці не крычыць ён у няшчасьці сваім?
25 Ці ня плакаў я над пакрыўджаным? Ці душа мая не спагадала ўбогаму?
26 Чакаў я дабра, а прыйшло ліха, і шукаў сьвятла, але прыйшла цемра.
27 Нутро маё кіпіць і не змаўкае, нахлынулі на мяне дні гора майго.
28 Хаджу я счарнелы, але не ад сонца, устаю ў грамадзе і крычу.
29 Я стаўся братам для шакалаў і бліжнім для страусаў.
30 Скура мая счарнела на мне, і косткі мае высахлі ад сьпякоты.
31 Сталіся сумнымі гусьлі мае, і жалейка мая з плачам галосіць.

Ёў 31

1 Я заключыў запавет з вачамі маімі, каб не глядзець мне на дзяўчыну.

2 Якая ж доля мая ў Бога на вышыні, і якая спадчына ад Усемагутнага на вышынях?
3 Ці ж не загуба [прызначана] для ліхотніка, і няшчасьце — для злачынцы?
4 Ці ж Ён ня бачыць шляхоў маіх і ня лічыць усе крокі мае?
5 Ці ж хадзіў я ў марнасьці, і ці ж нага мая сьпяшалася да подступу?
6 Няхай узважыць Ён мяне на вагах справядлівых, і няхай ведае Бог невінаватасьць маю.
7 Калі зыходзіў крок мой са шляху, і пайшло за вокам маім сэрца маё, і запляміла рукі мае што нячыстае,
8 няхай я пасею, а есьці будзе іншы, і нашчадкі мае будуць вырваныя з каранямі.
9 Калі сэрца маё зьвяла жанчына, і калі цікаваў я пры дзьвярах бліжняга майго,
10 няхай жонка мая меле для другога, і няхай іншыя прыхіляюцца да яе.
11 Бо гэта брыдота, злачынства, што падлягае суду.
12 Гэта агонь, які палае для Абадону, які выкараняе ўсю маёмасьць маю.
13 Калі я адмовіў суду слузе майму і служцы маёй, калі яны спрачаліся са мною,
14 што я буду рабіць, калі паўстане Бог? І калі Ён наведае мяне, што я адкажу Яму?
15 Ці ж ня Той, Хто мяне ўфармаваў ва ўлоньні, уфармаваў і яго; і ва ўлоньні [маці] ўкшталтаваў нас Адзіны?
16 Ці ж адмовіў я ў просьбе ўбогім і ці засмуціў вочы ўдавы?
17 Ці я адзін зьядаў кавалак свой, і ці ня еў яго сірата?
18 Бо ад маленства гадаваў я яго, як бацька, і вёў яго ад улоньня маці.
19 Калі я бачыў таго, што гіне без адзеньня, або бедака, што ня меў чым накрыцца,
20 ці ж не дабраслаўлялі мяне сьцёгны ягоныя, калі грэла іх воўна авечак маіх?
21 Калі я падымаў руку маю на сірату, калі бачыў у браме дапамогу сабе,
22 няхай адпадзе рамяно ад сьпіны маёй, і няхай рука мая адломіцца ад локця.
23 Бо страшнае мне было пакараньне Божае, перад веліччу Яго я не магу ўстаяць!
24 Ці ў золаце я меў спадзяваньне? І ці золату чыстаму я казаў: “Надзея мая”?
25 Ці цешыўся я дзеля мноства багацьцяў маіх, што рука мая столькі прыдбала?
26 Калі я бачыў сонца, як яно зьзяе, або месяц, які ў яснасьці плыве,
27 ці спакусіўся я таемна ў сэрцы маім, і ці цалавалі вусны мае руку маю?
28 Гэта было б злачынства, што падлягае суду, бо я адрокся б ад Бога на вышынях.
29 Ці я цешыўся з падзеньня таго, хто ненавідзеў мяне, і ці радаваўся, што яго напаткала няшчасьце?
30 Але я не даваў грашыць паднябеньню майму, каб праклінаць душу ягоную.
31 Ці ж не гаварылі людзі намёту майго: “Хто ж не насыціўся мясам ягоным!”
32 На двары не заставаўся прыхадзень, брама мая была адкрытая для падарожнікаў.
33 Ці ўтойваў я грэх мой як [іншы] чалавек, і ці хаваў за пазухай правіну маю?
34 Тады б я баяўся грамады вялікай, і пагарда бліжніх палохала б мяне, і маўчаў бы я, і не выходзіў за дзьверы.
35 Хто мне дасьць таго, хто паслухае мяне? Вось подпіс мой. Няхай Усемагутны адкажа мне! Вось кніга, якую напісаў супраціўнік мой,
36 каб я насіў яе на плячах маіх і налажыў яе сабе, як вянец.
37 Я паведамлю яму лік крокаў маіх і пайду да яго, як да начальніка.
38 Калі б жалілася на мяне зямля мая, і з ёй плакалі барозны ейныя,
39 што плады ейныя я еў бяз срэбра, і што крыўдзіў душу ўласьніка яе,
40 няхай замест пшаніцы родзіцца мне калючка, а замест ячменю — кукаль!» Скончыліся словы Ёва.

Ёў 32

1 І перасталі тыя тры чалавекі адказваць Ёву, бо ён быў праведны ў вачах сваіх.
2 І ўзгарэўся гневам Элігу, сын Барахеэля Бузяніна, з роду Рама. І запалаў ён гневам на Ёва, бо той лічыў душу сваю больш праведнай за Бога.

3 І запалаў гнеў ягоны таксама на сяброў ягоных, што не знайшлі яны адказу яму, але [толькі]
вінавацілі Ёва.
4 І чакаў Элігу, калі Ёў гаварыў, бо яны былі старэйшымі за яго днямі.
5 І ўбачыў Элігу, што тыя тры ня маюць адказу ў вуснах сваіх, і запалаў гнеў ягоны.
6 І адказаў Элігу, сын Барахеэля Бузяніна, і сказаў: «Я — малодшы за вас днямі, а вы —
старэйшыя, дзеля гэтага я вагаўся і баяўся выказваць вам думку сваю.
7 Я казаў сабе: “Няхай [многія] дні гавораць, і няхай шматгадовы вучыць мудрасьці”.
8 Але дух ёсьць у чалавеку і дыханьне Усемагутнага дае яму разуменьне.
9 Не [заўсёды] шматгадовы — мудры, і ня [толькі] старыя разумеюць суд.
10 Таму я кажу: “Паслухайце мяне, і я выкажу веданьне сваё”.
11 Вось, чакаў я на словы вашыя, і настаўляў вуха на разумнасьць вашую, пакуль вы шукалі
словаў,
12 і намагаўся, каб мне зразумець вас. І вось, няма такога, хто аспрэчыць Ёва, і хто можа
адказаць на словы ягоныя.
13 Не кажыце: “Мы знайшлі мудрасьць. Няхай Бог пераможа яго, а не чалавек”.
14 Ня супраць мяне словы [Ёва], і не паводле словаў вашых адкажу яму.
15 Яны спалохаліся, і не адказваюць болей, і ня маюць ужо словаў.
16 Яшчэ пачакаў я, яны не гаварылі, стаялі і болей не адказвалі.
17 Я таксама адкажу ў сваю чаргу, і выкажу думку маю.
18 Бо я поўны словаў, і сьціскае дыханьне ў-ва мне дух мой.
19 Таксама нутро маё, як віно закаркаванае, што разрывае новыя мяхі.
20 Няхай я скажу і стане лягчэй крыху, адкрыю вусны мае і адкажу.
21 Ня буду зьвяртаць увагі на асобу, і ня буду патураць чалавеку,
22 бо ня ўмею лісьлівіць, іначай няхай адразу возьме мяне Творца мой.

Ёў 33

1 Дык выслухай, Ёве, прамову маю і прыхілі вуха на ўсе словы мае.
2 Вось, я адкрываю вусны свае, і язык мой гаворыць у вуснах маіх.
3 Ад шчырага сэрца плывуць словы мае, і яснае веданьне кажуць вусны мае.
4 Дух Божы ўчыніў мяне, і дыханьне Усемагутнага ажывіла мяне.
5 Падрыхтуйся і стань перад абліччам маім, і прадстаў справу тваю.
6 Вось, я, як вусны твае перад Богам, таксама я з гліны ўфармаваны.
7 Вось страх [перада] мною няхай цябе не палохае, і рука мая няхай ня будзе цяжкаю над
табою.
8 Тое, што ты гаварыў — у вушах маіх, і я чуў голас словаў тваіх:
9 “Чысты я, бяз грэху, беззаганны, і няма віны ў-ва мне.
10 Але [Бог] знайшоў абвінавачваньне супраць мяне, і лічыць мяне ворагам Сваім.
11 Ён закаваў у кайданы ногі мае, пільнуе ўсе сьцежкі мае”.
12 Вось, у гэтым ты няправедны. Я адкажу табе, бо Бог большы за чалавека.
13 Чаму ты спрачаешся з Ім, што Ён не адказвае табе ніводнага слова?
14 Бог прамаўляе і адзін раз, і другі, а [чалавек] не зважае на гэта.
15 У сьне і ў відзежы начным, калі моцны сон агартае людзей і ў дрымоце на ложку,
16 адкрывае Ён вуха людзям, і палохае іх у зьявах,
17 каб адвярнуць чалавека ад учынкаў [ліхіх], і вызваліць яго ад пыхлівасьці,
18 каб захаваць душу ягоную ад магілы, і жыцьцё ягонае, каб не загінула ад дзіды.
19 Ён дакарае яго хваробаю на ложку ягоным і болем безупынным у костках ягоных.
20 І жыцьцё ягонае брыдзіцца хлебам, і душа ягоная — страваю найлепшаю.
21 Цела яго зьнікае на вачах, і косткі, звычайна ня бачныя, адкрываюцца.
22 Набліжаецца душа ягоная да магілы, і жыцьцё ягонае — да памёршых.

23 Калі пры ім анёл-абаронца, адзін з тысячы, які распавядзе чалавеку, у чым праведнасьць ягоная,
24 тады зьлітуецца [Бог] над ім і скажа: “Выратуй яго, каб не ішоў ён у магілу, бо Я знайшоў выкуп [за яго]”.
25 Тады цела ягонае стане, як у маладосьці, і вернецца ён у дні юнацтва свайго.
26 Ён будзе маліць Бога, і [Бог] будзе спагадны яму, і ўбачыць аблічча ягонае радасным, і верне чалавеку праведнасьць ягоную.
27 І ён паглядзіць на людзей і скажа: “Я грашыў і чыніў няправасьць, і не аднагароджана мне.
28 Ён выкупіў душу маю, каб не трапіла ў магілу, і будзе бачыць сьвятло жыцьцё маё”.
29 Вось, усё гэта робіць Бог два, і тры разы з чалавекам,
30 каб адвесьці душу ягоную ад магілы, і прасьвятліць яго сьвятлом жывых.
31 Уважай, Ёве, паслухай мяне, і памаўчы, і я прамоўлю.
32 Калі маеш словы, адкажы мне. Прамоў, бо хачу, каб ты аказаўся праведным.
33 Калі ж ня маеш, паслухай мяне. Маўчы, і я навучу цябе мудрасьці».

Ёў 34

1 І гаварыў Элігу, і сказаў:
2 «Мудрыя, слухайце словы мае, і знаўцы, прыхіліце вушы да мяне.
3 Бо вуха выспрабоўвае словы, як паднябеньне смакуе страву.
4 Разьбяромся між сабою, што слушнае, і зразумеем, што добрае.
5 Бо Ёў сказаў: “Я — праведны, а Бог пазбавіў мяне суду.
6 Ці буду я казаць хлусьліва пра праўду маю? Небясьпечная рана мая, а я без віны”.
7 Ці ёсьць такі чалавек, як Ёў, які п’е зьнявагі, як ваду,
8 і ідзе разам са злачынцамі, і ходзіць з людзьмі бязбожнымі?
9 Бо ён сказаў: “Няма карысьці чалавеку, калі ён дагаджае Богу”.
10 Дык паслухайце мяне, людзі разумныя! Бог далёкі ад няправасьці, і Усемагутны — ад беззаконьня.
11 Бо Ён паводле ўчынкаў аднагароджвае чалавеку, паводле шляхоў кожнага аднагароджвае яму.
12 Сапраўды, Бог ня чыніць несправядлівасьці, і Усемагутны не перакручвае суд.
13 Хто даручыў Яму зямлю? Хто паставіў Яго над усім сусьветам?
14 Калі б Ён накіраваў да Сябе сэрца Сваё, і ўзяў да Сябе Духа Свайго і дыханьне Сваё,
15 тады загінула б кожнае цела, і чалавек перамяніўся б у парахно.
16 Калі ты маеш розум, паслухай гэта, прыхілі вуха на голас словаў маіх.
17 Ці той, хто ненавідзіць суд, можа кіраваць? Ці асудзіш ты Найправеднейшага?
18 Ці можна сказаць валадару: “Нягоднік”, або начальнікам: “Бязбожнікі”.
19 Але Ён не глядзіць на абліччы князёў і ня лічыць багатага вышэй за ўбогага. Бо ўсе яны — творы рук Ягоных.
20 Неспадзявана паміраюць яны, і сярод ночы паўстае народ, і яны зьнікаюць, і моцных выганяюць не рукой [чалавека].
21 Бо вочы Ягоныя — над шляхамі чалавека, і Ён бачыць усе крокі ягоныя.
22 Няма цемры, ані змроку, каб там маглі схавацца злачынцы.
23 Бо Ён не прызначае чалавеку тэрмін, каб той ішоў да Бога на суд.
24 Ён зьнішчае магутных без запытаньня і на іх месца стаўляе іншых.
25 Ён ведае ўчынкі іхнія і скідвае іх ноччу, і яны гінуць.
26 Ён ударае іх за бязбожнасьць іхнюю на бачным месцы
27 за тое, што яны адвярнуліся ад Яго і не разумелі ўсіх шляхоў Ягоных.
28 Бо дайшоў да Яго крык убогіх, і Ён пачуў стагнаньне прыгнечаных.
29 Калі Ён супакоіць, хто можа асудзіць? Калі схавае аблічча Сваё, хто можа ўбачыць Яго? Будзе гэта і для народу, і для аднаго чалавека,

30 каб не валадарыў чалавек нягодны і ня быў ён пасткай для народу.
31 Трэба казаць да Бога: “Я нясу [пакараньне], ня буду больш грашыць.
32 Чаго я ня бачу, Ты навучы мяне. Калі я зрабіў злачынства, болей гэтага рабіць ня буду”.
33 На [думку] тваю, ці павінен Ён адплаціць [табе], бо ты адкідаеш [гэта]? Бо ты сам, а ня я выбіраеш [казаць гэта]. А калі ведаеш што [больш], скажы.
34 Людзі разумныя скажуць мне, і чалавек мудры, які слухае мяне, [прамовіць]:
35 “Ёў неразумна кажа, і словы ягоныя без разуменьня”.
36 Няхай будзе Ёў дасьледаваны да канца, паводле адказаў ягоных, якія ўласцівыя людзям беззаконным.
37 Бо ён дадае да грахоў сваіх правіну, і сярод нас пляскае ў далоні, і памнажае прамовы свае супраць Бога».

Ёў 35

1 І адказаў Элігу, і сказаў:
2 «Што ты лічыш слушным, калі ты сказаў: “Праведнасьць мая большая, чым у Бога”?
3 Бо ты сказаў: “Што за карысьць мне і што я атрымаю з гэтага, чым калі б я грашыў?”
4 Я адкажу табе словамі, і сябрам тваім з табою.
5 Паглядзі на неба і пабач; паглядзі на аблокі, яны вышэйшыя за цябе.
6 Калі ты саграшыш, што зробіш ты Яму? І калі грахі твае памнажаюцца, чым ты зашкодзіш Яму?
7 А калі будзеш праведны, што дасі Яму? Або што Ён атрымае з рукі тваёй?
8 Чалавеку, падобнаму да цябе, ліхота твая [шкодзіць], а праведнасьць твая [патрэбна] сыну чалавечаму.
9 Ад мноства прыгнятальнікаў яны галосяць, з прычыны [цяжкага] рамяна моцных.
10 Але [ніхто] ня кажа: “Дзе ж Бог, Які стварыў мяне, Які дае сьпевы ўначы,
11 Які вучыць нас болей, чым жывёлаў зямных, і больш, чым птушак нябесных, робіць нас мудрымі?”
12 Там яны лямантуюць, але Ён не адказвае ім з прычыны пыхлівасьці злачынцаў.
13 Толькі марноты ня слухае Бог і ня бачыць Усемагутны.
14 Хоць ты сказаў, што ня бачыш Яго, разгляд [справы] — перад абліччам Ягоным, і ты чакай на Яго.
15 І цяпер, калі не палае гнеў Ягоны, Ён не зважае зашмат на нягоднасьць.
16 Надарма Ёў адчыніў вусны свае і множыць прамовы бяздумныя».

Ёў 36

1 І працягваў Элігу, і сказаў:
2 «Пачакай мяне трохі, і я пакажу табе, што маю яшчэ словы пра Бога.
3 Пачну здалёк навучаньне маё, і Творцу майму аддам праведнасьць.
4 Бо праўдзівыя і без падману словы мае, і з табою я дасканалы ў веданьні.
5 Вось, Бог магутны і не адкідае нікога, Ён магутны моцай сэрца.
6 Ён не дае жыць бязбожніку, але дае суд убогаму.
7 Не адварочвае Ён ад праведных вачэй Сваіх, але саджае іх з валадарамі на пасадзе назаўжды, і яны ўзвышаюцца.
8 І калі яны закаваныя ў кайданы і зьвязаныя путамі гора,
9 Ён паказвае ім учынкі іхнія і злачынствы іхнія, што яны памножыліся.
10 І Ён адкрывае вуха іхняе, каб навучыць іх, і гаворыць ім, каб адвярнуліся ад ліхоты.
11 Калі паслухаюцца і будуць служыць Яму, яны пражывуць дні свае ў дабрабыце і гады свае — у прыемнасьці.
12 А калі не паслухаюцца, тады загінуць ад дзіды і памруць з нястачы веданьня.

13 Крывадушнікі складаюць гнеў у сэрцы сваім і ня клічуць [Бога], калі Ён закоўвае іх [у
кайданы].
14 У марнасьці памірае душа іхняя і жыцьцё іхняе між распусьнікамі.
15 Ён ратуе ўбогага з уціску ягонага і адкрывае вуха ягонае ў трывозе.
16 Таксама цябе Ён выбавіць з цясноты на прастору, дзе няма ўціску, і будзе поўнае тлушчу ўсё
на стале тваім.
17 Але ты поўны меркаваньняў бязбожных, і чакаюць цябе суд і вырак.
18 Няхай не зьвядзе цябе гнеў, і вялікі выкуп няхай ня скрывіць [шляхоў] тваіх.
19 Ці ў няшчасьці крык твой дапаможа або намаганьні сілы тваёй?
20 Не жадай тае ночы, калі народы паднімаюцца з месцаў сваіх.
21 Сьцеражыся, каб не зьвярнуўся да злачынства, бо праз яго ты спазнаеш гора.
22 Вось, Бог узьвялічаны ў моцы Сваёй. Які настаўнік падобны да Яго?
23 Хто можа вызначыць шляхі Ягоныя? І хто можа сказаць Яму: “Ты ўчыніў зло”?
24 Памятай, каб услаўляць учынкі Ягоныя, пра якія сьпяваюць людзі.
25 Усе людзі бачаць гэта, кожны прыглядаецца здалёк.
26 Вось, Бог вялікі і перавышае веданьне нашае; лік гадоў Ягоных — неаблічальны.
27 Ён зьбірае кроплі вады, і падаюць яны дажджом з хмары Ягонай.
28 Яны цякуць з хмараў і выліваюцца на многіх людзей.
29 Хто можа разумець разьлегласьць аблокаў і грымоты намёту Ягонага?
30 Вось, Ён расьцягнуў вакол Сябе сьвятло Сваё і закрывае глыбіні мора.
31 Адтуль Ён судзіць народы, і шчодра корміць іх.
32 У руках Сваіх Ён трымае маланку і загадвае ёй, куды цэліць.
33 Грукат ейны паведамляе пра яе, нават статкі адчуваюць прыход яе.

Ёў 37

1 Ад гэтага дрыжыць сэрца маё, і яно зрушылася з месца свайго.
2 Слыхам слухайце гук голасу Ягонага і грымот, які выходзіць з вуснаў Ягоных.
3 Пад усім небам Ён пускае яго, і бляск Ягоны — аж да краю зямлі.
4 За ім грыміць голас, грыміць голас велічы Ягонай, і Ён не спыняе яго, пакуль ня будзе пачуты
голас Яго.
5 Грыміць Бог голасам страшным Сваім, і чыніць рэчы вялікія і незразумелыя.
6 Ён гаворыць сьнегу: “Зыйдзі на зямлю”, залеве дажджовай: “Будзь залевай дажджу
вялікага”.
7 Ён кладзе пячатку на руку кожнага чалавека, каб усе людзі ведалі справы Ягоныя.
8 І зьвер хаваецца ў логавішча і жыве ў пячоры сваёй.
9 З поўдня прыходзіць бура, а з поўначы — холад.
10 З подыху Божага зьяўляецца лёд, і паверхня вады ільдом сьціскаецца.
11 Вільгацьцю Ён напаўняе аблокі, і хмары разганяе сьвятлом Сваім.
12 І асьвятляе яно ўсё кругом паводле волі Ягонай, каб рабіць усё, што загадае Ён на абліччы
сусьвету.
13 Ці то на пакараньне зямлі, ці то дзеля міласэрнасьці Ён наводзіць яго.
14 Прыхілі вуха да гэтага, Ёве, і стань, і паразважай пра цуды Божыя.
15 Ці ты ведаеш, як загадвае Бог, каб хмары Ягоныя заясьнелі сьвятлом?
16 Ці ведаеш ты, як падвешаны аблокі, і пра цуды Таго, Хто ў веданьні дасканалы?
17 Ці не награваецца адзеньне тваё, калі зямля супачывае ад ветру паўднёвага?
18 Ці ты з Ім расьцягнуў аблокі, моцныя, як люстэрка, адлітае [з мэталю]?
19 Навучы нас, што маем сказаць Яму? Мы ў гэтай цемры ня можам прадставіць [справу
нашую].
20 Хто раскажа Яму тое, што я прамаўляю? Ці скажа хто Яму, каб ня быць зьнішчаным?
21 І цяпер ня бачым мы сьвятла за хмарамі, але пройдзе вецер і разгоніць іх.

22 З поўначы прыходзіць [яснасьць] залатая, і вакол Бога — велічнасьць страшлівая.
23 Усемагутнага знайсьці мы ня можам: Ён — магутны ў сіле, судзе і праведнасьці, але не прыгнятае нікога.
24 Дзеля таго няхай баяцца Яго людзі, бо Ён не зважае на ўсіх мудрых сэрцам».

Ёў 38

1 І адказаў ГОСПАД з віхуры, і сказаў:
2 «Хто гэта, што неразумнымі словамі зацямняе задумы Мае?
3 Падпержы, як мужчына, паясьніцу тваю, і Я буду пытацца ў цябе, і ты тлумач Мне.
4 Дзе ты быў, калі Я закладваў падваліны зямлі? Адкажы Мне, калі маеш веды?
5 Хто даў меру ёй, ці ты ведаеш? Або хто працягнуў над ёй вяроўку мерную?
6 На чым замацаваны падваліны яе? Або хто залажыў кутні камень яе,
7 калі гаманілі з радасьцю зоркі ранішнія, і калі радасна ўсклікалі ўсе сыны Божыя?
8 Хто зачыніў мора брамамі, калі вырывалася яно, [нібы] з улоньня выходзіла;
9 калі апранаў у хмары яго, і ў імглу, як у пялёнкі, спавіваў?
10 Я паставіў мору межы ейныя, і паставіў загарадкі і брамы,
11 і сказаў: “Дасюль дойдзеш, а далей не пяройдзеш, і тут спыніш узбураныя хвалі твае”.
12 Ці ты загадваў у дні твае сьвітаньню і ці вызначаў зараніцы месца яе,
13 каб ахапіла яна канцы зямлі, і каб вынішчаны былі на ёй бязбожнікі,
14 каб [зямля] зьмянілася як гліна пад пячаткай, і сталася, як адзеньне каляровае,
15 каб забранае было ад бязбожных сьвятло іхняе і зламанае рамяно ўзьнесенае?
16 Ці ты даходзіў да крыніцаў мора, і ці ты хадзіў па дне бяздоньня?
17 Ці адкрытыя былі табе брамы сьмерці, і ці бачыў ты дзьверы цемры сьмяротнай?
18 Ці аглядаў ты абшары зямлі? Раскажы Мне, калі ведаеш усё гэта.
19 Пры якой дарозе жыве сьвятло, і дзе месца цемры,
20 каб завесьці яе да межаў ейных, і ведаць сьцежкі да дому яе?
21 Ты ведаеш, бо тады ты быў ужо народжаны, і лік дзён тваіх вельмі вялікі!
22 Ці ты даходзіў да сховішча сьнегу і ці бачыў сховішча граду,
23 які Я падрыхтаваў на час гора і на дзень бою і вайны?
24 Па якім шляху разьліваецца сьвятло і разыходзіцца вецер палючы па зямлі?
25 Хто вызначыў пратоку для навальніцы і шляхі для маланкі і грымотаў,
26 каб ліў дождж на зямлю бязьлюдную, на пустыню, дзе няма ніводнага чалавека,
27 каб насыціць [вадою] пустыню і пушчу, і каб вырасьціць траву [на засохлай зямлі]?
28 Хто ёсьць бацькам дажджу? Або хто нарадзіў кроплі расы?
29 З чыйго нутра выйшаў лёд, і хто родзіць шэраш на небе?
30 Як камень вада цьвярдзее, і аблічча бяздоньня замярзае.
31 Ці ты можаш зьвязаць зьвязы Стажар’я, і ці можаш разьвязаць вузел Касцоў?
32 Ці ты выведзеш зорку ранішнюю ў свой час, і ці Воз з сынамі ягонымі накіруеш?
33 Ці ты ведаеш законы неба, і ці можаш напісаць іх на зямлі?
34 Ці можаш падняць голас твой да аблокаў і хвалямі вады накрыць сябе?
35 Ці можаш паслаць бліскавіцы, і ці пойдуць яны, і ці скажуць табе: “Вось мы!”
36 Хто ўлажыў у нутро ібіса мудрасьць, і хто пеўню даў розум?
37 Хто мудрасьцю лічыць хмары, і хто можа нахіліць начыньні нябесныя,
38 калі пыл цьвярдзее ў камяні, замяняецца ў груды?
39 Ці ты для ільвіцы наловіш здабычы, і голад ільвянятаў задаволіш,
40 калі яны вылежваюцца ў логвах сваіх, або ў гушчары цікуюць?
41 Хто гатуе крумкачу страву ягоную, калі дзеці ягоныя клічуць да Бога і блукаюць бяз ежы?

Ёў 39

1 Ці ты ведаеш час пароду дзікіх козаў у скалах, або сачыў за пародамі ланяў?
2 Ці ты лічыш месяцы цяжарнасьці іхняй, або ведаеш час іх нараджэньня?
3 Схіляюцца яны, родзячы дзяцей сваіх, і вызваляюцца ад болю нараджэньня.
4 Дзеці іхнія набіраюць сілы і растуць у полі, і выходзяць, і не вяртаюцца да іх.
5 Хто пусьціў дзікага асла на свабоду, і хто разьвязаў путы ягоныя?
6 Я даў яму дом у пустыні, і на зямлі салёнай прызначыў жытло яму.
7 Ён сьмяецца з гармідару гораду і ня чуе крыку паганятага,
8 на гарах знаходзіць сабе пашу і шукае ўсякую зеляніну.
9 Ці захоча аднарог служыць табе, ці пераначуе ён пры ясьлях тваіх?
10 Ці ты можаш прывязаць аднарога вяроўкаю да плуга, ці будзе ён араць лагчыны за табою?
11 Ці ты паверыш у вялікую сілу ягоную, і даручыш яму працу тваю?
12 Ці паверыш яму, што ён верне зерне тваё і зьбярэ на ток?
13 Крылы страуса радасна махаюць, але ці яны такія, як крылы і пер'е бусла?
14 Бо ён пакідае яйкі свае на зямлі, і яны грэюцца ў пяску,
15 і забываецца ён, што можа нага стаптаць іх і зьвер палявы раздушыць.
16 Нячулы ён да дзяцей сваіх, быццам яны не ягоныя, і не трывожыцца ён, што праца ягоная можа быць дарэмнай,
17 бо пазбавіў яго Бог мудрасьці і ня даў яму розуму.
18 А калі прыйдзе час, і ён падыме ўгору крылы, тады ён сьмяецца з каня і вершніка ягонага.
19 Ці ты даеш каню сілу? Ці ты ахінаеш шыю ягоную грывай?
20 Ці ты прымусіш бегчы яго, як саранчу? Велічнае іржаньне ягонае жах наводзіць.
21 Ён б'е зямлю капытом, і цешыцца сілаю, і выходзіць адважна насустрач зброі.
22 Ён сьмяецца над страхам, не палохаецца, і не ўцякае перад мячом.
23 Калі гучыць над ім сагайдак, вострыва дзіды, ці рагаціны,
24 ён з шаленствам і лютасьцю каўтае зямлю, і не спыняецца пры гуку трубы.
25 На гук трубы іржэ: "І-га-га!" і здалёку ён вычувае бітву, воклічы князёў і крык [ваенны].
26 Ці паводле разуменьня твайго лётае ястраб і накіроўвае крылы свае на поўдзень?
27 Ці паводле загаду твайго падымаецца арол, і на вышынях робіць гняздо сваё?
28 Ён жыве на скалах і [там] начуе, на вяршынях скальных замчышча ягонае.
29 Адтуль выгледжвае ён сабе ежу, вочы ягоныя бачаць далёка,
30 а птушаняты ягоныя п'юць кроў, і дзе толькі забіты, там і ён».
31 І адказаў ГОСПАД Ёву, і сказаў:
32 «Ці той, хто спрачаецца з Усемагутным, будзе вучыць? Той, хто вінаваціць Бога, няхай адкажа».
33 І адказаў Ёў ГОСПАДУ, і сказаў:
34 «Вось, я, нікчэмны, што магу Табе адказаць? Я кладу руку маю на вусны мае.
35 Раз я гаварыў, і гэтага не паўтару, і другі раз, але нічога не дадам».

Ёў 40

1 І адказаў ГОСПАД Ёву з віхуры, і сказаў:
2 «Падпержы, як мужчына, сьцёгны твае. Я буду пытацца ў цябе, а ты тлумач Мне.
3 Ці хочаш ты зьнішчыць суд Мой? Ці ты асудзіш Мяне, каб сябе апраўдаць?
4 Калі ты маеш рамяно, як Бог, і калі ты падобным голасам грыміш, як Ён,
5 тады апраніся ў маестат і велічнасьць, і адзенься ў годнасьць і красу.
6 Зьяві ярасьць гневу твайго, і паглядзі на ўсіх пыхліўцаў, і ўпакор іх.
7 Глянь на ўсіх пыхліўцаў, і асаром іх, і выгубі бязбожных на месцах іхніх.
8 Пахавай іх разам у пыле, і абліччы іхнія закрый цемраю.
9 І Я таксама буду славіць цябе, калі правіца твая дапаможа табе.

10 Вось, бегемот, якога Я стварыў, як і цябе, і есьць ён траву як вол.
11 Вось, сіла ягоная — у сьцёгнах ягоных, і моц ягоная — у цягліцах жывата ягонага.
12 Ён круціць хвастом сваім, як кедрам, жылы сьцёгнаў ягоных моцна сплецены.
13 Косткі ягоныя — як трубы мядзяныя, і ногі ягоныя — як пруты жалезныя.
14 Ён ёсьць пачаткам шляхоў Божых. Толькі Той, Хто стварыў яго, можа паднесьці да яго меч.
15 Горы прыносяць ежу яму, і ўсе зьвяры палявыя гуляюць там.
16 Ён сьпіць пад ценем лотасу, схаваўшыся ў трысьнягу і дрыгве.
17 Лотасы хаваюць яго ў ценю сваім, атачаюць яго вербы пры ручаі.
18 Калі рака ўздымаецца, ён не баіцца, ён бясьпечны, хоць Ярдан даходзіць да пашчы ягонай.
19 Ці можа хто ўзяць яго на вачах ягоных? Ці можаш пракалоць яму ноздры гакам?
20 Ці можаш ты Левіятана выцягнуць кручком і вяроўкаю схапіць яго за язык?
21 Ці ўложыш ты трысьціну ў ноздры ягоныя або ці праколеш пашчэнку ягоную цярнінай?
22 Ці будзе ён дужа прасіць цябе або гаварыць да цябе лагодна?
23 Ці заключыць ён з табою запавет, і ты возьмеш яго як слугу навечна?
24 Ці пагуляеш ты з ім, як з птушкаю, або прывяжаш яго для дачок сваіх?
25 Ці ты справіш над ім частаваньне супольнае, і ці падзеляць яго між купцамі?
26 Ці зможаш прабіць скуру ягоную дзідаю, а галаву ягоную — восьцямі рыбацкімі?
27 Палажы на яго руку тваю, і рыхтуйся да бою, бо болей [гэтага] ня зробіш.

Ёў 41

1 Вось, спадзяваньне тваё фальшывае. На выгляд ягоны ты ўпадзеш.
2 Няма сьмелых, каб будзіць яго. А хто тады можа стаць перад абліччам Маім?
3 Хто стане перада Мною, і застанецца цэлым? Пад усім небам ён — Мой.
4 Ня буду маўчаць пра часткі цела яго, пра сілу і прыгажосьць іхнюю.
5 Хто можа адкрыць аблічча адзеньня ягонага, і хто падыйдзе да падвойных сківіцаў ягоных?
6 Хто можа адкрыць браму аблічча ягонага? Навокал зубоў ягоных жах!
7 Сьпіна ягоная — як моцныя шчыты, скрэпленыя краменнай пячаткай.
8 Адзін з адным злучаныя, нават паветра праз іх ня пройдзе.
9 Адзін да аднаго шчыльна прылягае, і трымаюцца моцна, і нельга разьдзяліць іх.
10 Чханьне ягонае бліскае сьвятлом, а вочы ягоныя — як павекі зараніцы.
11 З пашчы ягонай выходзіць полымя, выскокваюць іскры агністыя.
12 З ноздраў ягоных выходзіць дым, як з гаршчка нагрэтага, што кіпіць.
13 Подых ягоны распальвае вуглі, і з пашчы ягонай выходзіць полымя.
14 У шыі ягонай начуе сіла, і перад ім жах уцякае.
15 Мяса нутра ягонага сьціснутае, цьвёрдае, не здрыганецца.
16 Сэрца ягонае цьвёрдае, як камень, цьвёрдае, як ніжні камень млынавы.
17 Калі ён устае, дрыжаць асілкі, і хаваюцца ад жаху.
18 Меч, які кранецца яго, не ўстаіць, ані дзіда, ані страла, ані рагаціна.
19 Жалеза лічыць ён за салому, а медзь — за дрэва гнілое.
20 Не палохае яго сын луку, і камень з пушчалкі яму як сена.
21 Доўбня яму як сьцяблінка, і сьмяецца ён з дзіды, што ляціць.
22 Пад ім вострыя камяні, і ён на вострых камянях ляжыць як у балоце.
23 Ён глыбіню водаў разаграе як кацёл, і мора ператварае ў кіпень.
24 За сабой пакідае сьветлую сьцежку, і бездань падаецца сівізною.
25 Няма яму роўнага на зямлі, ён створаны бясстрашным.
26 На ўсё магутнае ён глядзіць з вышыні, ён — валадар над усімі сынамі пыхлівасьці».

Ёў 42

1 І адказаў Ёў ГОСПАДУ, і сказаў:

2 «Ведаючы, ведаю, што Ты ўсё можаш, і што намер Твой ня можа быць спынены.
3 Хто той, які хавае параду бяз веданьня? Сапраўды, я гаварыў, і не разумеў. Гэта рэчы,
цудоўнейшыя за мяне, і я ня ведаю іх.
4 Паслухай, і я буду гаварыць. Запытаюся ў цябе, а Ты адкажы мне.
5 Раней я чуў пра Цябе толькі вухам, а цяпер вока маё ўбачыла Цябе.
6 Дзеля таго я выракаюся [словаў] маіх, і каюся ў пыле і попеле».
7 І сталася пасьля таго, як сказаў ГОСПАД гэтыя словы Ёву, сказаў ГОСПАД Эліфазу з Тэману:
«Узгарэўся гнеў Мой на цябе і на двух сяброў тваіх, бо не гаварылі вы пра Мяне слушна, як
слуга Мой Ёў.
8 І цяпер вазьміце сем бычкоў і сем бараноў, і пайдзіце да слугі Майго Ёва, і складзіце цэла-
спаленьне за сябе. І слуга Мой Ёў памоліцца за вас. І Я ўзгляну на аблічча ягонае, і не зраблю
вам благога, хоць вы не гаварылі пра Мяне слушна, як слуга Мой Ёў».
9 І пайшлі Эліфаз з Тэману, Більдад з Шуаху і Цафар з Наамы, і зрабілі так, як сказаў ім ГОСПАД.
І ўзглянуў ГОСПАД на аблічча Ёва.
10 І вярнуў ГОСПАД страту Ёву, калі ён памаліўся за сяброў сваіх. І даў ГОСПАД Ёву ўдвая болей
таго, што ён меў раней.
11 І прыйшлі да яго ўсе браты ягоныя, і ўсе сёстры ягоныя, і ўсе, хто раней ведаў яго, і елі з ім
хлеб у доме ягоным, і спачувалі яму, і пацяшалі яго з прычыны няшчасьця, якое на яго спаслаў
ГОСПАД. І кожны даў яму па адной кесыце і па адным залатым пярсьцёнку.
12 І дабраславіў ГОСПАД апошнія [дні] Ёва больш, чым папярэднія. І было ў яго чатырнаццаць
тысячаў авечак і шэсьць тысячаў вярблюдаў, тысяча параў валоў і тысяча асьліцаў.
13 І было ў яго сем сыноў і тры дачкі.
14 І назваў ён імя першай — Еміма, імя другой — Кецыя, а імя трэцяй — Керэн-Гапух.
15 І не знайшлося на ўсёй зямлі такіх прыгожых жанчынаў, як дочкі Ёва. І даў ім бацька іхні
спадчыну між братамі іхнімі.
16 І жыў Ёў пасьля таго сто сорак гадоў, і бачыў сыноў сваіх і сыноў сыноў сваіх аж да
чацьвёртага пакаленьня.
17 І памёр Ёў стары і насычаны днямі.

КНІГА ПСАЛЬМАЎ

Пс 1

1 Шчасьлівы чалавек, які не хадзіў паводле рады бязбожнікаў, не стаяў на шляху грэшнікаў і
не сядзеў паміж насьмешнікаў,
2 бо да Закону ГОСПАДА імкненьне ягонае і пра Закон Ягоны будзе разважаць ён днём і ноччу.
3 І будзе ён як дрэва, пасаджанае пры цячэньні водаў, якое прыносіць плод свой у часе сваім,
і лістота якога ня вяне, і ў-ва ўсім, што ён робіць, ён посьпех мае.
4 Ня гэтак бязбожнікі, яны як мякіна, якую вецер разносіць.
5 Таму не ўстаяць бязбожнікі на судзе, ані грэшнікі ў грамадзе праведных,
6 бо ГОСПАД ведае шлях праведных, а шлях бязбожнікаў загіне.

Пс 2

1 Чаму бунтуюцца народы, і плямёны задумваюць марнае?
2 Паўстаюць валадары зямлі, і князі сабраліся разам супраць ГОСПАДА і супраць Памазанца
Ягонага:
3 «Парвема кайданы іхнія і путы іхнія скіньма з сябе!»
4 Той, Які жыве ў небе, будзе сьмяяцца, Госпад будзе кпіць з іх.
5 І скажа да іх у гневе Сваім, і ў ярасьці Сваёй напужае іх:
6 «Гэта Я паставіў Валадара Майго на Сыёне, гары Маёй сьвятой!»
7 Я абвяшчу пастанову: «ГОСПАД сказаў да Мяне: “Ты — Сын Мой, Я сёньня нарадзіў Цябе!
8 Зажадай ад Мяне, і дам Табе народы зямлі ў спадчыну, і межы зямныя — на ўласнасьць Табе.
9 Кіем жалезным паб’еш іх, быццам начыньне глінянае скрышыш іх”».
10 Дык цяпер, валадары, зразумейце, навучыцеся, судзьдзі зямлі!
11 Служыце ГОСПАДУ са страхам і радуйцеся з дрыжаньнем.
12 Ушануйце Сына, каб не разгневаўся і каб ня зьнішчыў шляху [вашага], бо неўзабаве
ўзгарыцца гнеў Ягоны! Шчасьлівыя ўсе, якія ў Ім маюць надзею.

Пс 3

1 Псальм Давіда, калі ён уцякаў ад аблічча Абсалома, сына свайго.
2 ГОСПАДЗЕ, як шматлікія сталі прыгнятальнікі мае! Шмат іх паўстае супраць мяне!
3 Шмат тых, якія кажуць пра душу маю: «Няма для яго збаўленьня ў Бога». (Сэлях)
4 Але Ты, ГОСПАДЗЕ, — шчыт для мяне, Ты — слава мая, і Ты падымаеш галаву маю.
5 Голасам маім я клікаў да ГОСПАДА, і Ён адказаў мне з гары Сваёй сьвятой. (Сэлях)
6 Я лёг і заснуў, і абудзіўся, бо ГОСПАД падтрымлівае мяне.
7 Не палохаюся я многіх тысячаў народу, што абступілі мяне наўкола.
8 Паўстань, ГОСПАДЗЕ! Збаў мяне, Божа мой! Бо Ты даў ворагам маім па сківіцах, Ты скрышыў
зубы бязбожнікаў.
9 У ГОСПАДА збаўленьне і для народу Твайго дабраслаўленьне Тваё. (Сэлях)

Пс 4

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Псальм Давіда.
2 Калі я клічу, адкажы мне, Божа, Праведнасьць мая! Калі я быў уцісканы, Ты даў мне прастору.
Зьлітуйся нада мною і пачуй малітву маю!
3 Сыны людзей, дакуль слава мая зьневажацца будзе, дакуль будзеце любіць марнасьць і
шукаць няпраўды? (Сэлях)
4 Спазнайце, што ГОСПАД аддзяліў багабойнага Свайго; ГОСПАД пачуе, калі буду клікаць да
Яго.
5 Дрыжыце і не грашыце! Кажыце ў сэрцах вашых на ложках вашых і маўчыце! (Сэлях)

6 Ахвяруйце ахвяры праведнасьці і спадзявайцеся на ГОСПАДА!
7 Шмат тых, якія кажуць: «Хто пакажа нам добрае?» Узьнімі над намі сьветласьць аблічча
Твайго, ГОСПАДЗЕ!
8 Ты даў у сэрцы маім большую радасьць, чым маюць яны, сабраўшы збожжа і віна багата.
(Сэлях)
9 У супакоі я лягу і засну, бо Ты, ГОСПАДЗЕ, адзін даеш мне жыць у бясьпецы.

Пс 5

1 Кіраўніку хору: на флейтах. Псальм Давіда.
2 Прыхілі вуха да словаў маіх, ГОСПАДЗЕ, зваж на ўздыханьне маё.
3 Выслухай голас крыку майго, Валадару мой і Божа мой, бо я да Цябе малюся.
4 ГОСПАДЗЕ, раніцаю пачуй голас мой; на досьвітку стану перад Табою і буду ўглядацца.
5 Бо Ты — Бог, Якому недаспадобы няправасьць; злыдзень ня будзе жыць пры Табе!
6 Тыя, што хваляцца сабою, ня будуць стаяць перад вачыма Тваімі, Ты ненавідзіш усіх
злачынцаў.
7 Ты зьнішчаеш хлусьлівых; крыважэрнымі і падступнымі брыдзіцца ГОСПАД.
8 А я праз вялікую міласэрнасьць Тваю ўвайду ў Дом Твой, і ў страху Тваім пакланюся ў
Сьвятыні сьвятасьці Тваёй.
9 ГОСПАДЗЕ, вядзі мяне ў праведнасьці Тваёй; насупраць ворагам маім выпрастуй шлях Твой
перад абліччам маім.
10 Бо няма шчырасьці ў вуснах іхніх; нутро іхняе — распуста; горла іхняе — магіла адчыненая;
языком сваім ашукваюць.
11 Абвінаваць іх, Божа! Няхай загінуць яны ад намераў сваіх! За мноства правінаў іхніх адкінь
Ты іх, бо яны збунтаваліся супраць Цябе.
12 І няхай радуюцца ўсе, якія ў Табе маюць надзею; няхай весяляцца навекі, бо Ты іх бароніш;
і няхай узрадуюцца ў Табе тыя, якія любяць імя Тваё.
13 Бо Ты дабраслаўляеш праведнага, ГОСПАДЗЕ, і ўпадабаньнем Тваім, як шчытом, засланяеш
яго.

Пс 6

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах, на актаву. Псальм Давіда.
2 ГОСПАДЗЕ, у гневе Тваім не карай мяне і ў ярасьці Тваёй не вучы мяне!
3 Зьлітуйся нада мною, ГОСПАДЗЕ, бо я нядужы; аздараві мяне, ГОСПАДЗЕ, бо трымцяць косткі
мае,
4 і душа мая трымціць вельмі. О, ГОСПАДЗЕ, дакуль?
5 Павярніся, ГОСПАДЗЕ, выратуй душу маю, збаў мяне дзеля міласэрнасьці Тваёй!
6 Бо ў сьмерці няма памяці пра Цябе, і ў пекле хто будзе славіць Цябе?
7 Я зьнямогся ад уздыханьня майго; штоноч паліваю я ложак мой, сьлязьмі паліваю пасьцель
маю.
8 Ад тугі высахла вока маё, састарэлася праз усіх, хто ўціскае мяне.
9 Адступіцеся ад мяне, усе злачынцы, бо ГОСПАД пачуў голас плачу майго.
10 ГОСПАД пачуў маленьне маё, ГОСПАД прыняў малітву маю.
11 Няхай будуць асаромленыя ворагі мае і няхай затрымцяць моцна, няхай павернуцца назад
і будуць імгненна асаромленыя.

Пс 7

1 Лямант Давіда, які засьпяваў ён ГОСПАДУ з прычыны Куша, сына Бэн'яміна.
2 ГОСПАДЗЕ, Божа мой! У Табе маю надзею! Збаў мяне ад усіх перасьледвальнікаў маіх і
вызваль мяне,
3 каб ня ўзяў, быццам леў, душы маёй і не разарваў мяне, калі няма каму ратаваць!
4 ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Калі я ўчыніў гэткае, калі ёсьць беззаконьне ў руках маіх,

5 калі зло я зрабіў таму, хто жыў са мной мірна, і не ратаваў таго, хто ўціскаў мяне без прычыны,
6 тады няхай перасьледуе вораг душу маю і дагоніць, няхай утопча ў зямлю жыцьцё маё і славу маю кіне ў пыл! (Сэлях)
7 Паўстань, ГОСПАДЗЕ, у гневе Тваім! Узьніміся супраць лютасьці тых, якія ўціскаюць мяне! Збудзіся, Божа мой, на суд, які Ты прызначыў!
8 І зьбярэцца сход народаў вакол Цябе, і Ты зьвернешся да іх з вышыні.
9 ГОСПАДЗЕ, асудзі народы. Судзі мяне, ГОСПАДЗЕ, паводле праведнасьці маёй і паводле беззаганнасьці маёй, што ёсьць у-ва мне!
10 Няхай счэзьне ліхота бязбожнікаў, але ўмацуй праведнага Ты, Які выспрабоўваеш сэрцы і ныркі, Божа Праведны!
11 Шчыт мой у Бога, Які збаўляе шчырых сэрцам,
12 у Бога, Які судзіць праведнага, і ў Бога, Які гневаецца штодзень [на бязбожніка].
13 Калі той не навернецца, Ён вострыць меч Свой, нацягнуў лук Свой і падрыхтаваў,
14 і паклаў на яго прылады сьмерці, стрэлы Свае Ён робіць распаленымі.
15 Вось, [бязбожнік] зачаў злачынства, і цяжарны ліхоцьцем, і народзіць хлусьню.
16 Яму капаў ён і выкапаў, і сам уваліцца ў дол, які зрабіў.
17 Ліхоцьце зьвернецца на галаву ягоную, і на цемя ягонае зыйдзе няправасьць ягоная.
18 Буду славіць ГОСПАДА паводле праведнасьці Ягонай і выслаўляць імя ГОСПАДА Найвышэйшага.

Пс 8

1 Кіраўніку хору: на лад Гітыт. Псальм Давіда.
2 ГОСПАДЗЕ, Госпадзе наш! Якое слаўнае імя Тваё па ўсёй зямлі! Слава Твая ўзьнесеная па-над нябёсы!
3 З вуснаў немаўлятаў і тых, што пры грудзях, Ты зрабіў умацаваньне супраць ненавісьнікаў Тваіх, каб спыніць ворага і мсьціўцу.
4 Калі я гляджу на неба Тваё, твор пальцаў Тваіх, на месяц і на зоркі, якія Ты паставіў,
5 я думаю: «Што ёсьць чалавек, што Ты памятаеш пра яго, і сын чалавечы, што Ты наведваеш яго?
6 Не нашмат Ты паменшыў яго перад багамі, і славай і веліччу Ты ўкаранаваў яго,
7 і даў яму панаваць над творамі рук Тваіх, і ўсё Ты паклаў пад ногі яму:
8 авечак і валоў усіх, і зьвяроў палявых,
9 птушак у небе, і рыбаў у моры, і ўсё, што ходзіць сьцежкамі марскімі».
10 ГОСПАДЗЕ, Госпадзе наш! Якое слаўнае імя Тваё па ўсёй зямлі!

Пс 9

1 Кіраўніку хору: на лад Мутлябэн. Псальм Давіда.
2 Буду славіць ГОСПАДА ад усяго сэрца майго, буду абвяшчаць усе цуды Твае!
3 Буду радавацца і весяліцца ў Табе, буду выслаўляць імя Тваё, Найвышэйшы!
4 Калі ворагі мае павернуць назад, яны спатыкнуцца і загінуць перад абліччам Тваім.
5 Бо Ты правёў суд мой і [разгледзеў] справу маю, Ты сеў на пасадзе таго, хто судзіць праведна.
6 Ты ўтаймаваў народы, Ты зьнішчыў бязбожніка, імя іхняе сьцёр на вякі вечныя.
7 Вораг спустошаны, канец яму назаўсёды. І гарады [ягоныя] Ты зруйнаваў, памяць пра іх зьнішчана.
8 А ГОСПАД сядзіць [на пасадзе] на вякі; Ён паставіў пасад Свой дзеля суду,
9 і Ён будзе судзіць сусьвет паводле праведнасьці і змагацца з народамі паводле справядлівасьці.
10 І будзе ГОСПАД умацаваным замкам для прыгнечанага, умацаваным замкам у час трывогі.
11 І будуць спадзявацца на Цябе тыя, якія ведаюць імя Тваё, бо Ты не пакідаеш тых, хто шукае Цябе, ГОСПАДЗЕ!
12 Выслаўляйце ГОСПАДА, Які сядзіць на Сыёне, апавядайце між народамі ўчынкі Ягоныя!

13 Бо Ён шукае [тых, што пралілі] кроў, памятае пра іх, Ён не забыўся пра крык уцісканых.
14 Зьлітуйся нада мною, ГОСПАДЗЕ! Глянь на пакуты мае ад тых, якія ненавідзяць мяне, Ты,
Які падымаеш мяне ад брамы сьмерці,
15 каб я абвяшчаў усю хвалу Тваю ў брамах дачкі Сыёну і радаваўся ў збаўленьні Тваім.
16 Уваліліся пагане ў яму, якую зрабілі; у сетку, якую схавалі, патрапіла нага іхняя.
17 ГОСПАД даў пазнаць Сябе, учыніўшы суд; у справах рук сваіх заблытаўся бязбожнік.
(Разважаньне. Сэлях)
18 Зыйдуць бязбожнікі ў пекла, усе пагане, якія забыліся пра Бога.
19 Бо не назаўсёды забыты будзе бедны, надзея прыгнечаных ня згіне навекі.
20 Паўстань, ГОСПАДЗЕ, ня дай чалавеку мець перавагу; пагане будуць суджаныя перад
абліччам Тваім!
21 Напусьці жах на іх, ГОСПАДЗЕ, каб пазналі пагане, што яны — людзі! (Сэлях)

Пс 10

1 Чаму стаіш здалёк, ГОСПАДЗЕ, хаваешся ў часе трывогі?
2 Бязбожнік у пыхлівасьці сваёй перасьледуе ўбогага. Няхай будзе ён схоплены ў
зламыснасьці, якую надумаў.
3 Бо хваліцца бязбожнік у пажаданьнях душы сваёй, і дабраслаўляе хціўца, і грэбуе ГОСПАДАМ.
4 Бязбожнік у ганарыстасьці гневу свайго не шукае [Бога]. «Няма Бога!» — усе думкі ў яго.
5 Шляхі ягоныя пасьпяховыя ў-ва ўсякі час; суды Твае высока аддаленыя ад яго; на ўсіх ворагаў
сваіх [грэбліва] дзьмухае ён.
6 Ён гаворыць у сэрцы сваім: «Я не пахіснуся, з пакаленьня ў пакаленьне ліха ня будзе [ў
мяне]».
7 Вусны ягоныя поўныя праклёнаў, ашуканства і здрады; пад языком ягоным — ліхота і
злачынства.
8 Ён сядзіць у засадзе на загуменьнях, у таемным месцы забівае нявіннага; вочы ягоныя сочаць
за нешчасьлівым.
9 Ён пільнуе ў засадзе, быццам леў у схове сваім; пільнуе, каб схапіць убогага; хапае ўбогага,
уцягваючы яго ў сетку сваю.
10 Ён згінаецца, туліцца [да зямлі], і ад моцы ягонай гіне шмат нешчасьлівых.
11 Ён кажа ў сэрцы сваім: «Бог забыўся, схаваў аблічча Сваё, ня ўбачыць ніколі!»
12 Паўстань, ГОСПАДЗЕ, Божа! Узьнімі руку Тваю, не забывайся пра ўцісканых!
13 Чаму бязбожнік пагарджае Богам, кажучы ў сэрцы сваім: «Ты ня будзеш шукаць [гэтага]»?
14 Але Ты бачыш, Ты глядзіш на ліхоту і гора, каб даць [аднагароду] рукою Тваёй. Табе пакідае
[свой лёс] нешчасьлівы; Ты быў дапамогай сіраце.
15 Зламай рамяно бязбожніку і ліхотніку, шукай беззаконьне ягонае, каб больш яго нельга
было знайсьці.
16 ГОСПАД — Валадар на вякі вечныя; пагане счэзнуць з зямлі Ягонай.
17 Ты пачуў жаданьне ўцісканых, ГОСПАДЗЕ! Ты ўмацуеш сэрцы іхнія, Ты прыхіліш вуха Тваё,
18 каб даць суд сіраце і пакрыўджанаму, каб больш не палохаў іх чалавек на зямлі!

Пс 11

1 Кіраўніку хору. Давіда. У ГОСПАДЗЕ маю надзею. Чаму вы кажаце душы маёй: «Уцякаючы,
уцякай на горы вашыя, як птушка»?
2 Бо вось, бязбожнікі нацягнулі лук, палажылі стралу сваю на цяціве, каб упоцемках страляць
у правых сэрцам.
3 Калі падмуркі будуць раскіданыя, што зробіць праведнік?
4 ГОСПАД у сьвятой сьвятыні Сваёй; пасад ГОСПАДА ў небе, вочы Ягоныя бачаць, павекі Ягоныя
выпрабоўваюць сыноў чалавечых.
5 ГОСПАД выпрабоўвае праведніка, але бязбожніка і таго, які любіць няправасьць, ненавідзіць
душа Ягоная.

6 Дажджом спашле Ён кары на бязбожнікаў; агонь, і серка, і вецер палючы будуць часткаю
келіха іхняга,
7 бо ГОСПАД праведны і любіць праведнасьць; правыя будуць бачыць аблічча Ягонае.

Пс 12

1 Кіраўніку хору: на актаву. Псальм Давіда.
2 Збаў, ГОСПАДЗЕ, бо ня стала багабойных, бо верныя зьніклі сярод сыноў чалавечых.
3 Марнасьць прамаўляе кожны да бліжняга, вуснамі лісьлівымі і сэрцам дваістым гавораць.
4 Няхай адсячэ ГОСПАД усе вусны лісьлівыя, язык, што дзёрзка прамаўляе,
5 тых, якія кажуць: «Языком нашым пераможам, вусны нашыя з намі! Хто гаспадар для нас?»
6 «За злачынствы супраць прыгнечаных, за стогны ўцісканых паўстану цяпер, — кажа ГОСПАД,
— пастаўлю ў бясьпецы таго, на якога дыхаюць [пагрозай]».
7 Словы ГОСПАДА — чыстыя словы, срэбра ў горне ад зямлі ачышчанае, сямікроць
ператопленае.
8 Ты, ГОСПАДЗЕ, абарані іх, захавай іх ад пакаленьня гэтага на вякі.
9 Навокал ходзяць бязбожнікі, бо сярод сыноў чалавечых узвысіліся найбольш нягодныя.

Пс 13

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Дакуль, ГОСПАДЗЕ? Ці назаўсёды забудзешся пра мяне? Дакуль будзеш хаваць аблічча Тваё
ад мяне?
3 Дакуль я буду складаць парады ў душы маёй, [складаць] смутак у сэрцы маім штодня?
Дакуль вораг мой будзе ўздымацца нада мною?
4 Глянь, адкажы мне, ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Прасьвятлі вочы мае, каб не заснуў я сьмерцю,
5 каб не казаў вораг мой: «Я перамог яго», каб прыгнятальнікі мае ня радаваліся, калі я
пахіснуся.
6 А я спадзяюся на міласэрнасьць Тваю; будзе радавацца сэрца маё са збаўленьня Твайго. Буду
сьпяваць ГОСПАДУ, бо Ён зрабіў дабро мне.

Пс 14

1 Кіраўніку хору. Давіда. Сказаў бязглузды ў сэрцы сваім: «Няма Бога!» Сапсаваліся яны і
агідныя рэчы робяць, няма таго, хто робіць дабро.
2 Глянуў ГОСПАД з неба на сыноў чалавечых, каб пабачыць, ці ёсьць разумны, які Бога шукае.
3 Усе ўхіліліся, усе разам нягодныя; няма нікога, хто робіць дабро, няма аніводнага!
4 Няўжо ня маюць пазнаньня ўсе злачынцы, якія народ мой зьядаюць, быццам хлеб ядуць, і
ГОСПАДА ня клічуць?
5 І будуць яны там у страху вялікім, бо ёсьць ГОСПАД у пакаленьні праведнікаў!
6 Радай прыгнечанага вы пагарджаеце, але ГОСПАД — прыстанішча ягонае.
7 Хто дасьць збаўленьне з Сыёну для Ізраіля? Калі ГОСПАД верне палонных народу Свайго,
будзе радавацца Якуб і будзе весяліцца Ізраіль!

Пс 15

1 Псальм Давіда. ГОСПАДЗЕ! Хто будзе жыць у намёце Тваім, хто паселіцца на гары Тваёй
сьвятой?
2 Той, хто ходзіць беззаганна, і чыніць праведнасьць, і кажа праўду ў сэрцы сваім,
3 хто языком сваім не ачарніў, не ўчыніў ліхога бліжняму свайму і ня ўзьвёў ганьбы на таго,
хто побач,
4 які таго, хто пагарджае [Богам], адкідае з вачэй сваіх, а таго, хто баіцца ГОСПАДА, ушаноўвае;
той, хто са шкодай для сябе прысягаў, але гэтага не зьмяняў;
5 хто срэбра свайго на ліхву не аддаваў і хабару супраць нявіннага ня браў. Хто гэтак робіць,
не пахісьнецца на вякі!

Пс 16

1 Залатая песьня Давіда. Захавай мяне, Божа, бо я ў Табе маю надзею.
2 Кажу я да ГОСПАДА: «Ты — Госпад мой; добрасьць мая нішто перад Табою».
3 Да сьвятых, якія на зямлі, і да слаўных [Тваіх], да іх усё імкненьне маё.
4 Памножацца прыкрасьці ў тых, якія сьпяшаюцца за [богам] чужым; я ня буду выліваць ахвяры іхняй крывавай, ані імёнаў іхніх ня буду браць у вусны мае.
5 ГОСПАД — частка долі маёй і келіху [майго]; Ты трымаеш лёс мой.
6 [Меральныя] шнуры мае прайшлі ў цудоўных [мясьцінах], і спадчына прыемная для мяне.
7 Буду дабраслаўляць ГОСПАДА, Які радзіць мне, і ўначы ўшчуваюць мяне ныркі мае.
8 Маю я ГОСПАДА перад сабою заўсёды, бо Ён праваруч мяне, дык не пахіснуся.
9 Дзеля гэтага ўзьвесялілася сэрца маё і радуецца слава мая, нават цела маё супачыне бясьпечна,
10 бо Ты не пакінеш душу маю ў пекле і не дасі сьвятому Твайму ўбачыць парахненьне.
11 Ты дасі мне ведаць шлях жыцьця; перад абліччам Тваім поўня радасьці, праваруч Цябе — раскоша заўсёды.

Пс 17

1 Малітва Давіда. Пачуй, ГОСПАДЗЕ, праведнасьць [маю], зваж на галашэньне маё, прыхілі вуха да малітвы маёй з вуснаў нефальшывых!
2 Ад аблічча Твайго няхай выйдзе прысуд мой; вочы Твае бачаць, што справядліва.
3 Ты выспрабаваў сэрца маё, уначы адведаў і ачысьціў мяне, і не знайшоў нічога; думкі ліхія ня выйшлі з вуснаў маіх.
4 У справах чалавечых паводле слова вуснаў Тваіх я высьцерагаўся сьцежкаў гвалту,
5 крокі мае трымаліся каляінаў Тваіх, стопы мае не хісталіся.
6 Да Цябе я гукаю, бо Ты, Божа, адкажаш мне. Прыхілі вуха Тваё да мяне, пачуй словы мае!
7 Зьяві міласэрнасьць Тваю, Збаўца тых, якія да правіцы Тваёй уцякаюць ад тых, што паўсталі [на іх].
8 Захавай мяне, як зрэнку вока, у ценю крылаў Тваіх схавай Ты мяне
9 ад бязбожнікаў, якія руйнуюць мяне, ад ворагаў душы маёй, якія атачылі мяне.
10 Тлушчам сваім яны закрылі сябе, вуснамі сваімі яны пыхліва гавораць.
11 На кожным кроку цяпер яны нас абступаюць; вочы свае скіравалі, каб нас кінуць на зямлю.
12 Яны падобныя да ільва, які прагне здабычы, і да львяняці, якое ў засадзе ляжыць.
13 Паўстань, ГОСПАДЗЕ! Выйдзі супраць аблічча ягонага, павалі Ты яго! Мячом Тваім выратуй душу маю ад бязбожніка,
14 ад сьмяротных [людзей] — рукой Тваёй, ГОСПАДЗЕ, ад сьмяротных [людзей] веку гэтага. Частка іхняя — у гэтым жыцьці, і чэрава іхняе Ты са скарбніцы Тваёй напаўняеш, яны насычаюць сыноў сваіх, і лішак свой пакідаюць дзецям сваім.
15 А я ў праведнасьці ўбачу аблічча Тваё, абудзіўшыся, насычуся вобразам Тваім.

Пс 18

1 Кіраўніку хору. Слугі ГОСПАДА Давіда, які выказаў ГОСПАДУ словы сьпеву гэтага ў дзень, калі ГОСПАД вызваліў яго з рук усіх ворагаў ягоных і з рукі Саўла, і ён сказаў [гэта].
2 Буду любіць Цябе, ГОСПАДЗЕ, сіла мая! ГОСПАД — скала мая, замчышча маё, мой Збаўца!
3 Мой Бог — апора мая, у Ім я маю надзею; Ён — шчыт мой, рог збаўленьня майго і ўмацаваны замак мой!
4 Паклічу я ГОСПАДА, Які годны хвалы, і ад ворагаў маіх збаўлены буду.
5 Ахапілі мяне путы сьмерці, і віры Бэліяла стурбавалі мяне;
6 путы пякельныя агарнулі мяне, і пасткі сьмерці схапілі мяне.
7 У прыгнечаньні маім я клікаў ГОСПАДА і галасіў да Бога майго. Ён пачуў са сьвятыні Сваёй голас мой, і лямант мой перад абліччам Ягоным дайшоў да вушэй Ягоных.
8 І, дрыжучы, задрыжэла зямля, і падваліны гор затрэсьліся і захісталіся, бо ўгнявіўся Ён.

9 Узьняўся дым ад гневу Ягонага, і з вуснаў Ягоных — агонь палючы, вугольле распальваецца ад Яго.
10 Нахіліў Ён неба і зыйшоў, і імгла пад нагамі Ягонымі.
11 Ён сеў на херувіма і паляцеў, і ўзьнёсься на крылах ветру.
12 Ён зрабіў цемру заслонай Сваёй, вакол Яго — намёт Ягоны з цёмных водаў, з густых хмараў.
13 Ад бляску перад Ім разыйшліся хмары Ягоныя, град і вугольле вогненнае.
14 І загрымеў у небе ГОСПАД, і Найвышэйшы падаў голас Свой, град і вугольле вогненнае.
15 І Ён пусьціў стрэлы Свае, і расьцярушыў іх, і мноствам маланак зьбянтэжыў іх.
16 І сталі бачныя рэчышчы водаў, і адкрыліся падваліны сусьвету ад пагрозаў Тваіх, ГОСПАДЗЕ, і ад подыху духу гневу Твайго.
17 Паслаўшы з вышыні, Ён схапіў мяне, выцягнуў мяне з водаў вялікіх,
18 вызваліў мяне ад ворага майго моцнага і ад тых, якія ненавідзяць мяне, бо яны былі дужэйшыя за мяне.
19 Яны схапілі мяне ў дзень няшчасьця майго, але ГОСПАД быў падпорай для мяне.
20 І Ён вывеў мяне на месца прасторнае, Ён выратаваў мяне, бо мне спагадае.
21 ГОСПАД даў мне паводле праведнасьці маёй, паводле чысьціні рук маіх мне аднагародзіў,
22 бо я захоўваў шляхі ГОСПАДА і не адступаў бязбожна ад Бога майго;
23 бо ўсе суды Ягоныя перада мною, і ад пастановаў Ягоных я не ўхіляўся.
24 Я быў беззаганны перад Ім і захоўваў сябе ад беззаконьня.
25 І аднагародзіў мне ГОСПАД паводле праведнасьці маёй, паводле чысьціні рук маіх перад вачыма Ягонымі.
26 З багабойным Ты будзеш багабойным, з чалавекам беззаганным будзеш беззаганны,
27 для чыстага сэрцам Ты чысты сэрцам, і для крывадушнага Ты падступны,
28 бо людзей прыгнечаных Ты збаўляеш, а вочы пыхлівыя паніжаеш.
29 Ты запаліш сьветач мой; ГОСПАД, Бог мой, асьветліць цемру маю.
30 Бо з Табою я атакую войскі і з Богам маім узыйду на муры.
31 Бог, беззаганны шлях Ягоны; слова ГОСПАДА чыстае; Ён — шчыт для ўсіх, хто ў Ім мае надзею.
32 Бо хто Бог, апрача ГОСПАДА, і хто скала, акрамя Бога нашага?
33 Бог, Які падпярэзвае мяне сілай і дае беззаганнасьць шляху майму;
34 Ён робіць ногі мае як у аленя і на вышыні ставіць мяне,
35 Ён навучае рукі мае для бітвы, і рамёны мае напінаюць лук мядзяны.
36 І Ты даў мне шчыт збаўленьня Твайго, і правіца Твая ўмацоўвала мяне, і ласкавасьць Твая ўзьвялічвала мяне.
37 Ты даў прастору для кроку майго, і не хісталіся ногі мае.
38 Я перасьледаваў ворагаў маіх і даганяў іх, і не варочаўся назад, пакуль ня зьнішчыў іх.
39 Я гэтак скрышыў іх, што яны не маглі ўстаць; яны падалі пад ногі мае.
40 Ты падперазаў мяне сілай дзеля бітвы, Ты паваліў перада мною тых, якія паўсталі супраць мяне.
41 Ты даў мне [бачыць] карак ворагаў маіх, і тых, што мяне ненавідзяць, я вынішчыў.
42 Яны галасілі, і не было таго, хто іх збавіць; яны [клікалі] да ГОСПАДА, але Ён не адказаў ім.
43 Я стоўк іх, як той пыл пад ветрам, як балота на вуліцы, я стаптаў іх.
44 Ты выратаваў мяне ад звадак людзей, паставіў мяне за галаву народам. Людзі, якіх я ня ведаў, будуць служыць мне.
45 Чуючы вушамі [пра мяне], яны слухаюцца мяне; сыны чужынцаў падпарадкаваліся мне.
46 Сыны чужынцаў млеюць і трымцяць у агароджах сваіх.
47 Жыве ГОСПАД, дабраслаўлёная скала мая; і няхай узвысіцца Бог збаўленьня майго,
48 Бог, Які адпомсьціў за мяне і схіліў народы перада мною,
49 выратаваў мяне ад ворагаў маіх і ўзвысіў мяне па-над тымі, якія паўсталі супраць мяне; ад чалавека злачыннага вызваліў мяне.
50 Дзеля гэтага буду славіць Цябе, ГОСПАДЗЕ, сярод народаў і імя Тваё выслаўляць.

51 Ты ўзьвялічыў збаўленьнем валадара Твайго і зьяўляеш міласэрнасьць памазанцу Твайму,
Давіду, і насеньню ягонаму на вякі.

Пс 19

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, і прасьцяг апавядае пра творы рук Ягоных.
3 Дзень дню пераказвае вестку, і ноч ночы выказвае веданьне.
4 Бяз гуку, бяз словаў, ня чутны голас іхні.
5 Па ўсёй зямлі разыходзіцца гучаньне іхняе, а мова іхняя — да краю сусьвету. На іх Ён паставіў
намёт для сонца,
6 і яно як жаніх выходзіць з пакою свайго, яно радасна гукае, як волат, калі прабег сьцяжыну
сваю.
7 Ад краю неба выходзіць яно і бяжыць да краю ягонага, і нішто не схаваецца ад гарачыні
ягонай.
8 Закон ГОСПАДА беззаганны, ён навяртае душу. Сьведчаньне ГОСПАДА вернае, яно робіць
мудрым неразумнага.
9 Загады ГОСПАДА слушныя, яны радуюць сэрца. Прыказаньне ГОСПАДА яснае, яно
прасьвятляе вочы.
10 Страх перад ГОСПАДАМ чысты, ён будзе трываць вечна. Суды ГОСПАДА праўдзівыя, а
таксама справядлівыя.
11 Яны больш пажаданыя, чым золата, больш, чым золата найчысьцейшае, і саладзейшыя за
мёд і мёд сотавы.
12 І слуга Твой праз іх будзе навучаны. Хто захоўвае іх, [будзе мець] нагароду вялікую.
13 Хто зразумее памылкі свае? Ад схаваных [грахоў] вызвалі мяне!
14 І трымай далёка слугу Твайго ад свавольства, няхай яно нада мною не пануе. Тады я буду
беззаганны і ня буду мець пакараньня за правіну вялікую.
15 Няхай словы вуснаў маіх і разважаньні сэрца майго будуць даспадобы Табе, ГОСПАДЗЕ,
Скала мая і Абаронца мой!

Пс 20

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Няхай ГОСПАД пачуе цябе ў дзень трывогі, няхай абароніць цябе імя Бога Якубавага!
3 Няхай Ён спашле табе дапамогу са сьвятыні і ўмацуе цябе з Сыёну!
4 Няхай Ён узгадае ўсе дары твае і цэласпаленьнямі тваімі няхай насыціцца. (Сэлях)
5 Няхай Ён дасьць табе паводле сэрца твайго і споўніць усе намеры твае,
6 каб мы ўзрадаваліся збаўленьню твайму і ў імя Бога нашага сьцяг узьнялі. Няхай споўніць
ГОСПАД усе прагненьні твае!
7 Цяпер я ведаю, што ГОСПАД збаўляе Памазанца Свайго; Ён адкажа яму са сьвятога неба
Свайго праз збаўчую магутнасьць правіцы Сваёй.
8 Гэтыя [спадзяюцца] на калясьніцы і коней, а мы ўзгадваем імя ГОСПАДА, Бога нашага.
9 Яны пахіснуліся і ўпалі, а мы паўсталі і стаімо проста.
10 Збаў нас, ГОСПАДЗЕ, і няхай валадар пачуе нас, калі будзем клікаць!

Пс 21

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 ГОСПАДЗЕ! У моцы Тваёй будзе радавацца валадар, у збаўленьні Тваім ён вельмі
ўсьцешыцца.
3 Ты даў яму жаданьне сэрца ягонага, і просьбам вуснаў ягоных Ты не адмовіў. (Сэлях)
4 Бо Ты сустрэў яго дабраслаўленьнем дабра, усклаў яму на галаву карону з найчысьцейшага
золата.
5 Жыцьцё ён прасіў у Цябе, Ты даў яму доўгасьць дзён на вякі вечныя.
6 Вялікая слава ягоная ў збаўленьні Тваім; годнасьць і веліч Ты ўзлажыў на яго.
7 Бо Ты даў яму дабраслаўленьне вечнае, Ты разьвесяліў яго радасьцю перад абліччам Тваім.

8 Бо валадар спадзяецца на ГОСПАДА і праз міласэрнасьць Найвышэйшага не пахісьнецца.
9 Рука Твая знойдзе ўсіх ворагаў Тваіх, правіца Твая знойдзе тых, якія ненавідзяць Цябе.
10 Ты зробіш з іх печ вогненную ў час [зьяўленьня] аблічча Твайго; ГОСПАД у гневе Сваім выгубіць іх, і агонь зжарэ іх.
11 Ты зьнішчыш плод іхні на зямлі і насеньне іхняе — спасярод сыноў чалавечых.
12 Бо яны кнулі ліхое супраць Цябе, надумалі зламыснае, якое не змаглі [зьдзейсьніць],
13 бо Ты павернеш іх наўцёкі, нацягнеш лук Твой супраць аблічча іхняга.
14 Узьніміся, ГОСПАДЗЕ, у моцы Тваёй! Мы будзем сьпяваць і выслаўляць магутнасьць Тваю.

Пс 22

1 Кіраўніку хору: на лад “Ланя на сьвітаньні”. Псальм Давіда.
2 Божа мой, Божа мой! Чаму Ты пакінуў мяне, аддаліўся ад збаўленьня майго, ад словаў стагнаньня майго?
3 Божа мой! Я клічу ўдзень, і Ты не адказваеш, і ўначы, і не супакойваюся.
4 Але Ты — Сьвяты, Ты сядзіш па-над хвалою Ізраіля!
5 На Цябе спадзяваліся бацькі нашыя, спадзяваліся, і Ты выратоўваў іх.
6 Да Цябе крычалі яны і былі збаўленыя; на Цябе спадзяваліся і не былі асаромленыя.
7 А я — чарвяк, а не чалавек, зьневажаны людзьмі і пагарджаны народам.
8 Усе, якія бачаць мяне, кпяць з мяне, крывячы вусны і ківаючы галовамі:
9 «Ён усклаў [надзею] на ГОСПАДА! Дык няхай Ён выратуе яго, няхай вызваліць яго, калі яму спагадае!»
10 Але Ты выцягнуў мяне з чэрава [маці], пры грудзях маці маёй [напоўніў] мяне спадзяваньнем.
11 На Цябе я пакінуты ад улоньня [маці]; ад чэрава маці маёй Ты — мой Бог!
12 Не аддаляйся ад мяне, бо блізка бяда, бо няма дапамогі!
13 Мяне абступілі дужыя быкі, бугаі Башанскія атачылі мяне.
14 Яны разявілі ляпы свае на мяне, быццам леў, які [прагне] здабычы і рыкае.
15 Я выліўся, быццам вада, і разьдзяліліся ўсе косткі мае. Сталася сэрца маё як воск, растапілася ў нутры маім.
16 Высахла як чарапок сіла мая, язык мой прыліп да паднябеньня майго, і ў пыл сьмерці Ты кідаеш мяне.
17 Бо сабакі абступілі мяне, грамада злачынцаў атачыла мяне, яны прабілі рукі мае і стопы мае.
18 Можна палічыць усе косткі мае. Яны глядзяць, на мяне ўглядаюцца.
19 Яны падзялілі адзеньне маё між сабою і пра вопратку маю кідалі жэрабя.
20 Але Ты, ГОСПАДЗЕ, не аддаляйся ад мяне! Моцнасьць мая, пасьпяшайся мне на ўспамогу!
21 Выратуй ад мяча душу маю, з пашчы сабак адзіную маю.
22 Збаў мяне з пашчы ільвінае, і з рагоў аднарога адкажы мне!
23 Дык я буду абвяшчаць імя Тваё братам маім, сярод царквы буду хваліць Цябе.
24 Вы, якія баіцёся ГОСПАДА, хвалеце Яго! Усё насеньне Якуба, ушаноўвайце Яго, і бойся Яго, усё насеньне Ізраіля!
25 Бо Ён не пагардзіў і ня брыдзіўся нэндзай прыгнечанага, і не схаваў аблічча Свайго ад яго, але пачуў яго, калі той галасіў да Яго.
26 Пра Цябе хвала мая ў царкве вялікай; абяцаньне маё я споўню перад абліччам тых, якія баяцца Цябе.
27 Будуць есьці ўцісканыя і насыцяцца; будуць хваліць ГОСПАДА тыя, якія шукаюць Яго. Сэрца вашае будзе жыць вечна!
28 Схамянуцца і зьвернуцца да ГОСПАДА ўсе канцы зямлі, і паклоняцца перад абліччам Тваім усе плямёны народаў.
29 Бо ГОСПАДУ [належыць] валадараньне і панаваньне над народамі.

30 Будуць есьці і паклоняцца [перад Ім] усе заможныя зямлі; упадуць перад абліччам Ягоным
усе, якія ў пыл зыходзяць і ня могуць захаваць пры жыцьці душу сваю.
31 Насеньне [маё] будзе служыць Яму і будзе называцца Госпадавым у пакаленьні.
32 Прыйдуць і будуць апавядаць народу, што мае нарадзіцца, праведнасьць Ягоную, бо Ён
[такое] зрабіў.

Пс 23

1 Псальм Давіда. ГОСПАД ёсьць Пастыр мой, ні ў чым ня буду мець нястачы!
2 На пашах зялёных Ён пасьвіць мяне, да водаў спакойных накіроўвае мяне.
3 Ён аднаўляе душу маю, на сьцежкі праведнасьці вядзе мяне дзеля імя Свайго.
4 Нават калі буду ісьці далінаю ценю сьмерці, ня буду баяцца ліха, бо Ты — са мною, кій Твой і
падпора Твая, яны пацяшаюць мяне.
5 Ты накрываеш перад абліччам маім стол насуперак тым, якія ўціскаюць мяне; галаву маю
Ты памазаў алеем, і келіх мой да верху наліты.
6 Толькі добрасьць і міласэрнасьць Твая будуць ісьці са мною ўсе дні жыцьця майго; і ў Доме
ГОСПАДА буду жыць доўгія дні.

Пс 24

1 Псальм Давіда. ГОСПАДАВА зямля і тое, што напаўняе яе, сусьвет і ўсё, што жыве ў ім.
2 Бо Ён на моры заснаваў яго, і на рэках угрунтаваў яго.
3 Хто ўзыйдзе на гару ГОСПАДА, і хто стане на месцы Ягоным сьвятым?
4 Той, у каго рукі бязьвінныя і сэрца чыстае, хто душы сваёй да марноты не схіляе і не прысягае
крывадушна,
5 той атрымае дабраслаўленьне ад ГОСПАДА і праведнасьць ад Бога збаўленьня свайго.
6 Гэта пакаленьне тых, якія шукаюць Яго, якія шукаюць аблічча Твайго, [Бог] Якуба! (Сэлях)
7 Узьніміце, брамы, вярхі вашыя! Узьніміцеся, дзьверы адвечныя, каб увайшоў Валадар славы!
8 Хто-ж ёсьць Валадар славы? ГОСПАД моцны і магутны, ГОСПАД магутны ў бітве.
9 Узьніміце, брамы, вярхі вашыя! Узьніміцеся, дзьверы адвечныя, каб увайшоў Валадар славы!
10 Хто ж ёсьць Валадар славы? ГОСПАД Магуцьцяў — Ён ёсьць Валадар славы! (Сэлях)

Пс 25

1 Давіда. Да Цябе, ГОСПАДЗЕ, узьнімаю я душу маю.
2 Божа мой! На Цябе спадзяюся; ня дай мне быць асаромленым, ня дай ворагам маім быць
нада мной пераможцамі.
3 Бо ўсе, якія на Цябе спадзяюцца, ня будуць асаромленыя. Будуць асаромлены тыя, якія
адступаюцца без прычыны.
4 ГОСПАДЗЕ, дай мне ведаць шляхі Твае, навучы мяне сьцежкам Тваім.
5 Вядзі мяне ў праўдзе Тваёй і навучы, бо Ты — Бог збаўленьня майго, на Цябе спадзяюся ў-ва
ўсякі дзень.
6 Узгадай пра літасьць Тваю, ГОСПАДЗЕ, і пра міласэрнасьць Тваю, бо яны — ад вякоў.
7 Пра грахі маладосьці маёй і пра правіны мае ня ўзгадвай. Паводле міласэрнасьці Тваёй Ты
ўзгадай пра мяне, дзеля добрасьці Тваёй, ГОСПАДЗЕ!
8 ГОСПАД добры і справядлівы, таму Ён будзе навучаць шляху [Свайму] грэшнікаў.
9 Ён прывядзе ўцісканых на суд і навучыць уцісканых шляху Свайму.
10 Усе сьцежкі ГОСПАДА — міласэрнасьць і праўда для тых, якія захоўваюць запавет Ягоны і
сьведчаньні Ягоныя.
11 Дзеля імя Твайго, ГОСПАДЗЕ, даруй мне беззаконьне маё, бо надта яно вялікае!
12 Хто той чалавек, які баіцца ГОСПАДА? Яго Ён навучыць шляху, які [трэба] выбраць яму.
13 Душа ягоная будзе жыць у добрым, і насеньне ягонае зямлю ў спадчыну возьме.
14 Таямніца ГОСПАДА з тымі, што баяцца Яго, і запавет Свой Ён дае ім ведаць.
15 Вочы мае заўсёды [глядзяць] на ГОСПАДА, бо Ён выцягне з сеткі ногі мае.

16 Павярніся да мяне і зьлітуйся нада мною, бо я — самотны і прыгнечаны.
17 Трывогі сэрца майго пашырыліся, выцягні мяне з бедаў маіх!
18 Глянь на пакуты мае і нядолю маю, і даруй мне ўсе грахі мае!
19 Глянь на ворагаў маіх, бо шмат іх, і нянавісьцю злачыннаю яны ненавідзяць мяне.
20 Захавай душу маю і выратуй мяне, каб ня быў я асаромлены, бо я ў Табе маю надзею.
21 Беззаганнасьць і праведнасьць няхай захаваюць мяне, бо я на Цябе спадзяюся.
22 Божа, збаў Ізраіля ад усіх трывогаў ягоных!

Пс 26

1 Давіда. Судзі мяне, ГОСПАДЗЕ, бо хадзіў я ў беззаганнасьці маёй і на ГОСПАДА спадзяваўся, не хістаючыся.
2 Выпрабуй мяне, ГОСПАДЗЕ, і дасьведчы; ачысьці ныркі мае і сэрца маё!
3 Бо міласэрнасьць Твая перад вачыма маімі, і я хаджу ў праўдзе Тваёй.
4 Я не сяджу з людзьмі марнымі, і з крывадушнымі ня буду хадзіць.
5 Я ненавіджу сходы злачынцаў, і з бязбожнікамі ня буду сядзець [разам].
6 Я абмыю ў нявіннасьці рукі мае і абыйду вакол ахвярніку Твайго, ГОСПАДЗЕ,
7 каб голасна дзякаваць Табе і абвяшчаць усе цуды Твае.
8 ГОСПАДЗЕ, я палюбіў сядзібу Дому Твайго і месца Сялібы славы Тваёй.
9 Не забяры душы маёй з грэшнікамі, ані жыцьця майго з людзьмі крывавымі,
10 у руках якіх брыдота, правіца якіх напоўнена хабарамі.
11 А я буду хадзіць у беззаганнасьці маёй. Вызвалі Ты мяне і зьлітуйся нада мною!
12 Нага мая на роўным [месцы] стаіць; у зграмаджэньнях я буду дабраслаўляць ГОСПАДА.

Пс 27

1 Давіда. ГОСПАД — сьвятло маё і збаўленьне маё. Каго мне баяцца? ГОСПАД — апора жыцьця майго. Каго мне палохацца?
2 Калі злачынцы выйдуць супраць мяне, каб пажэрці цела маё, прыгнятальнікі і ворагі мае, яны самі спатыкнуцца і ўпадуць.
3 Калі табар вайсковы стане супраць мяне, сэрца маё ня будзе баяцца; калі ўзьнімецца супраць мяне вайна, я і тады спадзявацца буду.
4 Аднаго я прашу ў ГОСПАДА і гэтага толькі шукаю, каб жыць мне ў Доме ГОСПАДА ўсе дні жыцьця майго, каб бачыць хараство ГОСПАДА і разважаць у сьвятыні Ягонай.
5 Бо Ён заслоніць мяне ў схове Сваім у дзень злы, Ён схавае мяне пад заслонай намёту Свайго і ўзьнясе мяне на скалу.
6 Гэтак будзе ўзьнесена цяпер галава мая па-над усімі ворагамі маімі вакол мяне, і буду ахвяроўваць ГОСПАДУ ахвяры ў намёце Ягоным пад трубныя гукі, буду сьпяваць і выслаўляць ГОСПАДА.
7 Пачуй, ГОСПАДЗЕ, голас мой, калі я клічу. Зьлітуйся нада мною і адкажы мне!
8 Пра Цябе кажа сэрца маё: «Шукайце аблічча Маё!» Я буду шукаць, ГОСПАДЗЕ, аблічча Тваё!
9 Не хавай ад мяне аблічча Тваё, не адцурайся ў гневе ад слугі Твайго! Ты быў мне ўспамогай! Не адкідай мяне і не пакінь мяне, Божа збаўленьня майго!
10 Бо бацька мой і маці мая пакінулі мяне, а ГОСПАД прыгарнуў мяне.
11 Навучы мяне, ГОСПАДЗЕ, шляху Твайму, і вядзі мяне роўнай сьцежкай насупраць ворагам маім!
12 Не аддавай мяне ў рукі прыгнятальнікаў маіх, бо сьведкі фальшывыя паўсталі супраць мяне і той, што дыхае няправасьцю.
13 Але я веру, што ўбачу добрасьць ГОСПАДА ў зямлі жывых.
14 Спадзявайся на ГОСПАДА! Будзь цьвёрды і сэрца тваё ўмацуй, і спадзявайся на ГОСПАДА!

Пс 28

1 Давіда. Да Цябе, ГОСПАДЗЕ, я клічу. Скала мая, не маўчы на мой [кліч], каб праз маўчаньне
Тваё ня стаўся я падобным да тых, якія зыходзяць у магілу.
2 Пачуй голас маленьня майго, калі я галашу да Цябе, калі ўзьнімаю рукі мае да давіру сьвятыні
Тваёй.
3 Не цягні мяне [да загубы] разам з бязбожнікамі і злачынцамі, якія кажуць: «Супакой»
бліжнім сваім, а ў сэрцах сваіх ліхое [маюць].
4 Дай ім паводле справаў іхніх і паводле ліхоты ўчынкаў іхніх; паводле таго, што рабілі рукі
іхнія, дай ім; аднагародзь ім за тое, што зрабілі яны.
5 Бо яны не разумеюць справаў ГОСПАДА і ўчынкаў рук Ягоных, дык Ён зруйнуе іх і не адбудуе.
6 Дабраслаўлёны ГОСПАД, бо Ён пачуў голас маленьня майго.
7 ГОСПАД — моц мая і шчыт мой; на Яго спадзявалася сэрца маё, і Ён дапамог мне; і
ўзрадавалася сэрца маё, і сьпевам маім буду славіць Яго.
8 ГОСПАД — моц для нас; Ён — апора збаўленьня памазанца Ягонага.
9 Збаў народ Твой і дабраславі спадчыну Тваю; пасьві іх і ўзьнімі іх на вякі.

Пс 29

1 Псальм Давіда. Аддайце ГОСПАДУ, сыны Божыя, аддайце ГОСПАДУ славу і моц!
2 Аддайце ГОСПАДУ славу імя Ягонага, пакланіцеся ГОСПАДУ ў велічы сьвятасьці!
3 Голас ГОСПАДА над водамі; Бог славы загрымеў, ГОСПАД над водамі шматлікімі.
4 Голас ГОСПАДА магутны, голас ГОСПАДА велічны.
5 Голас ГОСПАДА крышыць кедры, ГОСПАД крышыць кедры Лібанскія,
6 і прымушае іх скакаць, быццам цялятаў, Лібан і Сірыён, як маладых аднарогаў.
7 Голас ГОСПАДА выкрасае полымя агню.
8 Голас ГОСПАДА ўстрасае пустыняй, ГОСПАД устрасае пустыняй Кадэш.
9 Ад голасу ГОСПАДА лані зьлягаюць і лясы асыпаюцца, і ў сьвятыні Ягонай усё кажа: «Слава!»
10 Над патопам сядзеў ГОСПАД, і будзе сядзець ГОСПАД, як Валадар, на вякі!
11 ГОСПАД дасьць сілу народу Свайму, ГОСПАД дабраславіць народ Свой супакоем.

Пс 30

1 Псальм. Сьпеў пры пасьвячэньні дома Давіда.
2 Вывышаю Цябе, ГОСПАДЗЕ, бо Ты выцягнуў мяне і ня даў ворагам маім радавацца нада мною.
3 ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Я галасіў да Цябе, і Ты вылячыў мяне.
4 ГОСПАДЗЕ, Ты вывеў душу маю з пекла, Ты даў мне жыць, каб ня быў я сярод тых, што зыйшлі
ў магілу.
5 Выслаўляйце ГОСПАДА, вы, багабойныя Ягоныя, і слаўце на ўспамін сьвятасьці Ягонай!
6 Бо на імгненьне гнеў Ягоны, на [ўсё] жыцьцё ўпадабаньне Ягонае; увечары можа быць плач,
а раніцаю — радасьць.
7 А я сказаў у дабрадзенстве сваім: «Не пахіснуся на вякі!»
8 ГОСПАДЗЕ, праз ласку Тваю Ты паставіў горы мае непарушна; але Ты схаваў аблічча Тваё, і я
спалохаўся.
9 Да Цябе, ГОСПАДЗЕ, я клікаў, і Госпада майго я маліў:
10 «Які прыбытак з крыві маёй, з таго, што я зыйду ў парахненьне? Ці пыл будзе славіць Цябе?
Ці будзе апавядаць праўду Тваю?»
11 Пачуй, ГОСПАДЗЕ, і зьлітуйся нада мною! ГОСПАДЗЕ, будзь дапамогай маёй!
12 Ты перамяніў лямант мой у танец, Ты скінуў з мяне зрэбніцу і падперазаў мяне радасьцю.
13 Дзеля гэтага будзе выслаўляць Цябе слава [мая] і ня будзе маўчаць. ГОСПАДЗЕ, Божа мой,
на вякі я буду славіць Цябе!

Пс 31

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.

2 У Табе, ГОСПАДЗЕ, я маю надзею, ня дай мне асароміцца на вякі, у праведнасьці Тваёй выратуй Ты мяне!
3 Прыхілі да мяне вуха Тваё, хутчэй выратуй мяне! Будзь для мяне скалою, каб абаперціся [мне], домам умацаваным, каб збавіць мяне!
4 Бо Ты — скала мая і замчышча маё, дзеля імя Твайго Ты будзеш весьці мяне і накіроўваць мяне.
5 Ты мяне выцягнеш з сеці, якую таемна [наставілі] супраць мяне, бо Ты — апора мая.
6 У рукі Твае аддаю я дух мой; Ты выбавіў мяне, ГОСПАДЗЕ, Бог праўды.
7 Ненавіджу я тых, што захоўваюць ілжывую марнасьць, бо я на ГОСПАДА спадзяюся.
8 Я буду радавацца і весяліцца праз міласэрнасьць Тваю, бо Ты глянуў на пакуты мае, спазнаў трывогі душы маёй,
9 і не аддаў мяне ў рукі ворага, паставіў ногі мае на вольны прастор.
10 Зьлітуйся нада мною, ГОСПАДЗЕ, бо я — прыгнечаны. Ад тугі высахла вока маё, і душа мая, і нутро маё.
11 Бо зьнікае ў смутку жыцьцё маё, і гады мае — ва ўздыханьні. Спатыкнулася ў беззаконьні маім сіла мая, і высахлі косткі мае.
12 Я стаўся ганьбаю для ўсіх, што ўціскаюць мяне, і нават для суседзяў маіх, страхоцьцем — для знаёмых маіх; хто бачыць мяне на вуліцы, уцякае ад мяне.
13 Я забыты ў сэрцах, як мёртвы; я стаўся як посуд разьбіты.
14 Бо я чуў зласлоўе ад многіх, жах наўкола! Яны сабраліся разам супраць мяне, яны задумалі ліхое, каб забраць душу маю.
15 Але я на Цябе спадзяюся, ГОСПАДЗЕ! Я кажу: «Ты — мой Бог!»
16 У руцэ Тваёй час мой; выратуй мяне з рукі ворагаў маіх і тых, якія перасьледуюць мяне.
17 Няхай сьвеціць аблічча Тваё над слугою Тваім; збаў мяне праз міласэрнасьць Тваю!
18 ГОСПАДЗЕ, ня дай Ты мне асароміцца, бо да Цябе я клічу! Няхай асаромяцца бязбожнікі, няхай яны змоўкнуць у пекле,
19 няхай занямеюць вусны хлусьлівыя, якія кажуць дзёрзка супраць праведніка з пыхлівасьцю і пагардай!
20 Якая вялікая добрасьць Твая, якую Ты захоўваеш для тых, што баяцца Цябе, і якую ўчыняеш тым, што маюць надзею ў Табе насуперак сынам чалавечым!
21 Пад заслонай аблічча Твайго Ты хаваеш іх ад закалотаў людзкіх, Ты засланяеш іх, як у намёце, ад языкоў, якія звадку [прыносяць].
22 Дабраслаўлёны ГОСПАД, бо Ён учыніў мне цуды міласэрнасьці ў горадзе ўмацаваным.
23 А я сказаў у зьбянтэжанасьці маёй: «Я адкінуты ад вачэй Тваіх!» Але Ты пачуў голас маленьня майго, калі я галасіў да Цябе!
24 Любіце ГОСПАДА, усе багабойныя Ягоныя! Верных захоўвае ГОСПАД, але тым, якія дзейнічаюць пыхліва, Ён адплочвае з лішкам.
25 Будзьце цьвёрдыя і ўмацуйце сэрца вашае, вы, якія спадзяецеся на ГОСПАДА!

Пс 32

1 Навучаньне Давіда. Шчасьлівы, каму дараваная правіна, каму пакрыты грэх.
2 Шчасьлівы чалавек, якому не палічыў ГОСПАД беззаконьняў, і ў духу якога няма нядбальства.
3 Калі я маўчаў, ссохлі косткі мае ў штодзённым стагнаньні маім,
4 бо дзень і ноч абцяжарвала мяне рука Твая; сокі мае высахлі, быццам у летнюю сьпёку. (Сэлях)
5 Грэх мой я паведаміў Табе і не схаваў беззаконьня майго. Я сказаў: «Вызнаю ГОСПАДУ правіны мае», і Ты дараваў мне віну грэху майго. (Сэлях)
6 Таму кожны багабойны будзе маліцца да Цябе ў часе, калі можна знайсьці Цябе; нават калі разальюцца воды вялікія, яны не дакрануцца яго.
7 Ты — заслона мая! Ты мяне ад бяды захаваеш, радасьцю выратаваньня аточыш мяне. (Сэлях)

8 «Навучу цябе і пакажу табе шлях, па якім ты павінен ісьці, дам табе раду, бо вока Маё над
табою».
9 Ня будзьце, як конь і як мул, якія разуменьня ня маюць, якіх трэба аздобай іхняю, аброцьцю
і цуглямі, закілзаць, каб не кідаліся на цябе.
10 Шмат болю ў бязбожніка, а таго, хто спадзяецца на ГОСПАДА, міласэрнасьць атачае.
11 Радуйцеся ў ГОСПАДЗЕ і цешцеся, праведнікі! Весяліцеся, усе правыя сэрцам!

Пс 33

1 Весяліцеся ў ГОСПАДЗЕ, праведнікі; правым пасуе хвала.
2 Слаўце ГОСПАДА на гусьлях, выслаўляйце Яго на псалтыры дзесяціструнным!
3 Сьпявайце Яму новы сьпеў; спраўна грайце [Яму] пад трубныя гукі.
4 Бо слушнае слова ГОСПАДА, і ўсе творы Ягоныя верныя.
5 Ён любіць праведнасьць і суд; міласэрнасьцю ГОСПАДА напоўнена зямля.
6 Словам ГОСПАДА зроблены нябёсы, а подыхам вуснаў Ягоных — усе войскі іхнія.
7 Ён сабраў як капу воды марскія, Ён склаў іх у скарбніцу бяздоньняў.
8 Няхай баіцца ГОСПАДА ўся зямля, няхай дрыжаць перад Ім усе жыхары сусьвету.
9 Бо Ён сказаў — і сталася, Ён загадаў — і паўстала.
10 ГОСПАД разьбіў намеры паганаў, запярэчыў думкам народаў.
11 Намер ГОСПАДА будзе трываць на вякі, думкі сэрца Ягонага — з пакаленьня ў пакаленьне.
12 Шчасьлівы народ, у якога ГОСПАД ёсьць Бог, народ, які Ён выбраў на спадчыну для Сябе.
13 З неба ГОСПАД глядзіць, Ён бачыць усіх сыноў чалавечых;
14 з месца, дзе Ён жыве, Ён паглядае на ўсіх жыхароў зямлі.
15 Ён уфармаваў сэрца кожнага з іх, Ён зважае на ўсе ўчынкі іхнія.
16 Ня будзе збаўлены валадар войскам вялікім, волат ня вызваліцца праз вялікую сілу сваю;
17 ненадзейны конь для выратаваньня, і вялікая сіла ягоная ня дасьць выбаўленьня.
18 Вось, вока ГОСПАДА над тымі, якія баяцца Яго, якія спадзяюцца на міласэрнасьць Ягоную,
19 што Ён вызваліць ад сьмерці душы іхнія, і захавае жыцьцё ў [час] голаду.
20 Душа нашая чакае на ГОСПАДА; Ён — дапамога наша і шчыт наш.
21 Бо ў Ім радуецца сэрца нашае; бо мы на імя Яго сьвятое спадзяемся.
22 Няхай будзе міласэрнасьць Твая, ГОСПАДЗЕ, над намі, як мы на Цябе спадзяемся!

Пс 34

1 [Псальм] Давіда, калі ён перад Абімэлехам удаваў вар'ята і быў выгнаны ім, і пайшоў сабе.
2 Буду дабраслаўляць ГОСПАДА ў-ва ўсякі час; хвала Яго будзе заўсёды на вуснах маіх.
3 У ГОСПАДЗЕ будзе хваліцца душа мая; пачуюць [пра гэта] ўцісканыя і ўзрадуюцца.
4 Узьвялічвайце ГОСПАДА са мною, і разам будзем вывышаць імя Ягонае!
5 Я шукаў ГОСПАДА, і Ён адказаў мне, і ад усяго, чаго я баяўся, выратаваў мяне.
6 Глядзіце на Яго і зыходзьцеся [да Яго], і абліччы вашыя ня будуць у ганьбе.
7 Убогі клікаў, і ГОСПАД пачуў [яго], і збавіў яго ад усіх трывогаў ягоных.
8 Анёл ГОСПАДА ставіць табар вакол тых, якія баяцца Яго, і ратуе іх.
9 Паспытайце і ўбачце, які добры ГОСПАД! Шчасьлівы той чалавек, які ў Ім мае надзею.
10 Бойцеся ГОСПАДА, вы, сьвятыя Ягоныя! Бо ня маюць нястачы тыя, якія баяцца Яго.
11 Львяняты бядуюць і галадуюць, але тыя, што шукаюць ГОСПАДА, не адчуюць нястачы
ўсякага даброцьця.
12 Хадзіце сюды, сыны, паслухайце мяне, я навучу вас страху перад ГОСПАДАМ.
13 Хто ёсьць чалавек, якому даспадобы жыцьцё, які любіць [доўгія] дні, каб убачыць добрае?
14 Захоўвай язык свой ад ліхога, а вусны свае — ад слова крывадушнага.
15 Ухіляйся ад ліхога і рабі добрае; шукай супакою і імкніся да яго.
16 Вочы ГОСПАДА — на праведных, і вушы Ягоныя — на лямант іхні.
17 Аблічча ГОСПАДА — супраць тых, якія робяць ліхое, каб вынішчыць з зямлі памяць пра іх.

18 [Праведныя] крычаць, і ГОСПАД чуе іх, і ад усіх бедаў іхніх ратуе іх.
19 ГОСПАД блізкі да тых, у каго сэрца скрышанае, і збаўляе тых, у каго дух разьбіты.
20 Шмат ліхога [здараецца] ў праведнага, але з усяго гэтага ратуе яго ГОСПАД.
21 Ён захоўвае ўсе косткі ягоныя, каб ніводную не паламалі.
22 Ліхоцьце прывядзе да сьмерці бязбожніка, і будуць абвінавачаныя тыя, якія ненавідзяць Праведнага.
23 ГОСПАД выбаўляе душы слугаў Сваіх, і ўсе, якія маюць надзею ў Ім, ня будуць абвінавачаныя.

Пс 35

1 Давіда. Змагайся, ГОСПАДЗЕ, з тымі, якія ідуць супраць мяне; ваюй супраць тых, што ваююць са мною.
2 Вазьмі шчыт і панцыр і паўстань на ўспамогу мне.
3 Схапі дзіду і загарадзі дарогу тым, якія перасьледуюць мяне. Скажы душы маёй: «Я — збаўленьне тваё».
4 Няхай асаромяцца і будуць у сораме тыя, што шукаюць душу маю; няхай адступяцца і будуць у ганьбе тыя, што надумалі ліхое супраць мяне.
5 Няхай будуць яны, як мякіна пад ветрам, і анёл ГОСПАДА няхай гоніць іх.
6 Няхай шлях іхні будзе цёмны і сьлізкі, і анёл ГОСПАДА няхай перасьледуе іх.
7 Бо яны без прычыны таемна [наставілі] на мяне ў яме сетку сваю, без прычыны выкапалі яму для душы маёй.
8 Няхай прыйдзе на яго загуба нечакана, няхай сетка, якую ён таемна [наставіў], зловіць яго, няхай на загубу ўваліцца ён.
9 А душа мая будзе радавацца ў ГОСПАДЗЕ, будзе цешыцца збаўленьнем сваім.
10 Усе косткі мае скажуць: «ГОСПАДЗЕ, хто падобны да Цябе, Які ратуеш прыгнечанага ад дужэйшага за яго, беднага і прыгнечанага — ад таго, хто яго абдзірае?»
11 Паўстаюць сьведкі няправасьці, пра тое, чаго я ня ведаю, выпытваюць мяне,
12 плацяць мне злом за дабро; асірацела душа мая.
13 А я падчас нядужасьці іхняй апранаўся ў зрэбніцу, пастом прыгнятаў душу маю, і малітва мая вярталася ў грудзі мае.
14 Быццам ён быў прыяцель, брат мой, хадзіў я [да яго]; як у жалобе па маці, сумаваў я ў смутку.
15 Але калі я пачаў падаць, яны ўзрадаваліся і сабраліся разам, сабраліся разам супраць мяне, каб біць [мяне], і я ня ведаў [гэтага], зьневажалі [мяне] і не маўчалі.
16 Разам з крывадушнікамі насьмешнікі банкетуюць, скрыгочуць на мяне зубамі сваімі.
17 Госпадзе, як доўга будзеш глядзець [на гэта]? Адвядзі ад загубы іхняй душу маю, [вызваль] ад ільвянятаў адзіную маю.
18 Буду славіць Цябе ў царкве вялікай, сярод народу магутнага буду хваліць Цябе.
19 Няхай ня радуюцца з мяне тыя, што варагуюць са мною няслушна, няхай не міргаюць вачыма тыя, што ненавідзяць мяне без прычыны.
20 Бо не пра супакой гавораць яны і супраць ціхіх на зямлі падступныя словы надумляюць.
21 Шырока разявіўшы вусны свае супраць мяне, яны казалі: «Ага, ага! Бачыла вока нашае!»
22 Ты бачыў гэта, ГОСПАДЗЕ! Дык не маўчы, Госпадзе, не аддаляйся ад мяне!
23 Збудзіся! Абудзіся на суд мой, Бог мой і Госпад мой, каб [весьці] справу маю!
24 Судзі мяне паводле праведнасьці Тваёй, ГОСПАДЗЕ, Божа мой, і няхай яны ня радуюцца, [гледзячы] на мяне,
25 няхай ня скажуць у сэрцы сваім: «Ага! Душа наша [гэтага хацела]!» Няхай яны ня скажуць: «Мы праглынулі яго!»
26 Няхай асаромяцца і будуць у ганьбе ўсе, што радуюцца з няшчасьця майго; няхай у ганьбу і сорам апрануцца тыя, што вывышаюцца нада мною.
27 Няхай весяляцца і радуюцца тыя, якім даспадобы праведнасьць мая, і няхай яны кажуць заўсёды: «Будзь узьвялічаны, ГОСПАД, Якому даспадобы супакой слугі Ягонага!»

28 А язык мой будзе выказваць праведнасьць Тваю і хвалу Тваю кожны дзень.

Пс 36

1 Кіраўніку хору. Слугі ГОСПАДА Давіда.
2 Правіна бязбожніка засьведчана ў сэрцы маім: няма страху Божага перад вачыма ягонымі,
3 бо ён ашуквае сябе ў вачах сваіх, нібы шукае беззаконьня свайго, каб узьненавідзець яго.
4 Словы вуснаў ягоных — злачынства і падступнасьць, ён не захацеў разумець, каб рабіць добрае.
5 Ён злачынства надумляе на ложку сваім, ён стаіць на шляху нядобрым і ня грэбуе злом.
6 ГОСПАДЗЕ! Да нябёсаў міласэрнасьць Твая, а вернасьць Твая — аж да аблокаў!
7 Праведнасьць Твая — быццам Божыя горы, суды Твае — як вялізнае бяздоньне! Людзей і скаціну Ты збаўляеш, ГОСПАДЗЕ.
8 Якая каштоўная, Божа, міласэрнасьць Твая! Сыны чалавечыя ў ценю крылаў Тваіх маюць надзею.
9 Яны насычаюцца ад тлустасьці Дому Твайго, і са струмяня асалодаў Тваіх Ты іх поіш,
10 бо крыніца жыцьця — у Табе, у сьвятле Тваім мы бачым сьвятло.
11 Расьцягні міласэрнасьць Тваю над тымі, што ведаюць Цябе, і праведнасьць Тваю — над [людзьмі] са шчырым сэрцам.
12 Няхай не наступіць на мяне нага пыхлівых, і рука бязбожніка няхай ня зрушыць мяне.
13 Там упадуць злачынцы, паваляцца і ня здолеюць паўстаць.

Пс 37

1 Давіда. Ня гневайся, [гледзячы] на злачынцаў, не зайздросьці тым, што робяць беззаконьне,
2 бо яны, як трава, хутка ссохнуць, і павянуць, як расьліна зялёная.
3 Спадзявайся на ГОСПАДА і рабі добрае, жыві на зямлі, і захоўвай вернасьць.
4 Насалоджвайся ў ГОСПАДЗЕ, і Ён табе дасьць прагненьні сэрца твайго.
5 Аддай ГОСПАДУ шлях твой і спадзявайся на Яго, і Ён [усё] зробіць,
6 і выведзе праведнасьць тваю як сьвятло, і суд твой — як белы дзень.
7 Ціхі будзь перад ГОСПАДАМ і чакай на Яго, ня гневайся на таго, хто мае посьпех на шляху сваім, на чалавека, які робіць зламыснае.
8 Ухіліся ад гневу, пакінь ярасьць, ня гневайся, каб ты ня стаўся злачынцам,
9 бо злачынцы будуць зьнішчаныя, а тыя, што спадзяюцца на ГОСПАДА, возьмуць у спадчыну зямлю.
10 Яшчэ крыху, і ня будзе бязбожніка; глянеш на месца ягонае, а яго няма!
11 А пакорныя зямлю ў спадчыну возьмуць і будуць насалоджвацца ў мностве супакою.
12 Бязбожнік задумвае ліхое супраць праведнага і скрыгоча на яго зубамі сваімі.
13 Госпад сьмяецца з яго, бо бачыць, што прыходзіць дзень ягоны.
14 Бязбожнікі выцягнулі меч і нацягнулі лук свой, каб паваліць прыгнечанага і беднага, каб замардаваць тых, у каго шлях просты.
15 Меч іхні ўвойдзе ў сэрца іхняе, і лук іхні будзе зламаны.
16 Малое ў праведніка лепшае за багацьце шматлікіх бязбожнікаў.
17 Бо рамёны бязбожнікаў будуць скрышаныя, а праведнікаў падтрымлівае ГОСПАД.
18 Ведае ГОСПАД дні беззаганных, і спадчына іхняя будзе на вякі.
19 Ня будуць яны асаромленыя ў час ліхі, а ў дні голаду будуць насычаныя.
20 Бо загінуць бязбожнікі, і ворагі ГОСПАДА зьнікнуць, як тлустасьць авечак у дыме зьнікае.
21 Бярэ бязбожнік у доўг — і [доўгу] ня верне; а праведнік літуецца і дае.
22 Бо дабраслаўлёныя [Богам] зямлю ў спадчыну возьмуць, а тыя, што праклятыя Ім, будуць зьнішчаныя.
23 ГОСПАД умацоўвае крокі чалавека, калі шлях ягоны даспадобы Яму.
24 Калі ўпадзе, не заб'ецца, бо Госпад падтрымлівае руку ягоную.

25 Я быў малады і стаўся стары, і ня бачыў, каб праведнік быў пакінуты, каб насеньне ягонае
шукала хлеба.
26 Кожны дзень ён літуецца і пазычае, і насеньне ягонае мае дабраслаўленьне.
27 Аддаліся ад зла і рабі добрае, і будзеш жыць на вякі.
28 Бо ГОСПАД любіць суд, і Ён не пакіне багабойных Сваіх, на вякі захавае іх, а насеньне
бязбожнікаў будзе зьнішчана.
29 Праведнікі возьмуць у спадчыну зямлю і будуць жыць у ёй вечна.
30 Вусны праведніка выказваюць мудрасьць, і язык ягоны гаворыць суд.
31 Закон Бога ягонага ў сэрцы ягоным; ня будуць хістацца крокі ягоныя.
32 Бязбожнік сочыць за праведнікам і шукае, каб прывесьці да сьмерці яго.
33 ГОСПАД не пакіне яго ў руцэ ягонай, не асудзіць яго, калі ён будзе суджаны.
34 Спадзявайся на ГОСПАДА, і захоўвай шлях Ягоны, і Ён узвысіць цябе, каб ты ўзяў у спадчыну
зямлю; і калі будуць зьнішчаныя бязбожнікі, ты ўбачыш.
35 Я бачыў бязбожніка, моцнага і разгалінаванага, быццам галінастае тутэйшае дрэва,
36 але прамінуў ён, няма яго, і я шукаў яго, і не знайшоў.
37 Зважай на беззаганнага і глядзі на правага, бо канец [гэтага] чалавека ёсьць супакой.
38 А адступнікі будуць зьнішчаны чыста; і канец бязбожных — зьнішчэньне.
39 Выратаваньне праведнікаў — ад ГОСПАДА, Ён — апора іхняя ў час трывогі.
40 ГОСПАД дапаможа ім і вызваліць іх; Ён вызваліць іх ад бязбожнікаў і збавіць іх, бо яны ў Ім
маюць надзею.

Пс 38

1 Псальм Давіда. Напамін.
2 ГОСПАДЗЕ, у абурэньні Тваім не карай мяне і ў ярасьці Тваёй не вучы мяне!
3 Бо стрэлы Твае пранізалі мяне, і лягла на мяне рука Твая.
4 Няма цэлага месца ў целе маім дзеля гневу Твайго, няма супакою ў костках маіх дзеля грэху
майго.
5 Бо правіны мае ўзьняліся вышэй галавы маёй, як бярэмя цяжкое яны абцяжарваюць мяне.
6 Сьмярдзяць, гнаяцца раны мае дзеля дурасьці маёй.
7 Я скрывіўся, моцна схіліўся, усе дні ў смутку хаджу,
8 бо сьцёгны мае напоўненыя распаленымі [ранамі], і няма цэлага месца ў целе маім.
9 Я зьнямогся і моцна скрышаны, я выю дзеля енку сэрца майго.
10 Госпадзе мой, перад Табою ўсё жаданьне маё, і ўздыханьне маё ад Цябе не схаванае.
11 Сэрца маё трапечацца; пакінула мяне сіла мая, і сьвятло вачэй маіх — няма яго ў мяне.
12 Тыя, што любілі мяне, і бліжнія мае стаяць насупраць ранаў маіх, і сваякі мае стаяць здалёк
ад мяне.
13 Тыя, што шукаюць душу маю, ставяць сіло [на мяне]; а тыя, што жадаюць ліхога для мяне,
гавораць пра згубу маю і ўвесь дзень задумваюць падступнасьць.
14 А я, быццам глухі, ня чую, і быццам нямы, які не расчыняе вуснаў сваіх.
15 І стаўся я, быццам чалавек, які ня чуе, і няма дакараньня ў вуснах ягоных.
16 Бо на Цябе, ГОСПАДЗЕ, я спадзяюся; Ты адкажаш, Госпадзе, Божа мой!
17 Бо я сказаў: «Няхай яны ня радуюцца з мяне! Калі пахіснулася нага мая, няхай яны не
вывышаюцца нада мною».
18 Бо я блізкі да падзеньня, і боль мой заўсёды перада мною.
19 Бо беззаконьне маё я апавядаю, сумую дзеля грэху майго.
20 А ворагі мае жывыя і ўзмацняюцца, і шматлікімі сталі тыя, якія няслушна мяне ненавідзяць.
21 Яны плацяць мне злом за дабро; яны супрацьстаяць мне, бо я за добрым ганюся.
22 Не пакінь мяне, ГОСПАДЗЕ, Божа мой, не аддаляйся ад мяне!
23 Пасьпяшайся на ўспамогу мне, Госпадзе мой, выратаваньне маё!

Пс 39

1 Кіраўніку хору. Едутуну. Псальм Давіда.
2 Я сказаў: «Буду захоўваць шлях мой, каб не саграшыць языком маім! Буду захоўваць вусны
мае вуздою, пакуль бязбожнік перада мною».
3 Я зьнямеў у маўчаньні; маўчаў пра добрае, але боль мой нішчыў [мяне].
4 Распалілася сэрца маё ў нутры маім; ва ўздыханьні маім запалаў агонь, і я прамовіў языком
маім.
5 Дай мне ведаць, ГОСПАДЗЕ, канец мой і меру дзён маіх, якая яна. Дай мне ведаць, які я
нетрывалы!
6 Вось, на [некалькі] пядзяў Ты даў дні мае, і век мой — як нішто перад Табою! Толькі ўсякай
марнасьцю ёсьць кожны чалавек, [нават] у сіле. (Сэлях)
7 Толькі як здань ходзіць чалавек, [і ёсьць] толькі марнасьцю; ён трывожыцца, прагавіта
зьбірае і ня ведае, хто забярэ гэта.
8 І цяпер, на што [яшчэ] я спадзяюся, Госпадзе? Надзея мая ў Табе!
9 Ад усіх правінаў маіх выратуй мяне; на ганьбаваньне ад бязглуздых ня стаў мяне.
10 Я зьнямеў, не адчыняю вуснаў маіх, бо Ты зрабіў гэта.
11 Забяры ад мяне караньне Тваё, ад ударaў рукі Тваёй я зьнікаю.
12 Дакараньнем за беззаконьне Ты караеш чалавека і нявечыш, як ад молі, прагненьні ягоныя.
Толькі марнасьцю ёсьць кожны чалавек! (Сэлях)
13 Пачуй малітву маю, ГОСПАДЗЕ, і прыхілі вуха да ляманту майго! Не маўчы на сьлёзы мае,
бо я прыхадзень у Цябе і пасяленец, як і ўсе бацькі мае.
14 Не ўглядайся на мяне, каб я павесялеў перад тым, як зыйду, і ня будзе мяне!

Пс 40

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Спадзеючыся, спадзяваўся я на ГОСПАДА, і Ён схіліўся да мяне, і пачуў лямант мой.
3 І вывеў мяне з ямы бурлівае, з твані балотнае, і паставіў на скале ногі мае, і ўзмоцніў крокі
мае.
4 І даў у вусны мае новы сьпеў, хвалу Богу нашаму. Шматлікія ўбачаць [гэта], і будуць баяцца,
і будуць спадзявацца на ГОСПАДА.
5 Шчасьлівы чалавек, які пэўнасьць сваю мае ў ГОСПАДЗЕ, і не зьвяртаецца да ганарыстых і
тых, якія прыхіляюцца да няпраўды.
6 Шмат учыніў Ты, ГОСПАДЗЕ, Божа мой, цудаў Тваіх, а намеры Твае дзеля нас ні з чым не
параўнаеш перад Табою. Калі б я іх апавядаў і пра іх гаварыў, іх шматкроць больш, чым
[можна] палічыць.
7 Ахвяры і дары не даспадобы Табе; вушы Ты мне расчыніў. Цэласпаленьняў і ахвяры за грэх
Ты не вымагаеш.
8 Тады я сказаў: «Вось, я іду! У скрутку кнігі напісана пра мяне».
9 Рабіць тое, што падабаецца Табе, Божа мой, я жадаю, і Закон Твой — у нутры маім.
10 Я дабравесьціў пра праведнасьць у царкве вялікай; вось жа, вуснаў сваіх я ня стрымліваў,
Ты ведаеш [гэта], ГОСПАДЗЕ.
11 Праведнасьць Тваю я не хаваў у сэрцы маім, пра вернасьць Тваю і выратаваньне Тваё я казаў,
міласэрнасьці Тваёй і праўды Тваёй перад царквой вялікай ня ўтоіваў.
12 ГОСПАДЗЕ, ня стрымлівай літасьці Тваёй адносна мяне; міласэрнасьць Твая і праўда Твая
няхай заўсёды захоўваюць мяне,
13 бо агарнулі мяне ліхоцьці бяз ліку, дагналі мяне правіны мае, ажно не магу я іх палічыць,
іх больш, чым валасоў на галаве маёй, і сэрца маё пакінула мяне.
14 Мей ласку, ГОСПАДЗЕ, вызваліць мяне! ГОСПАДЗЕ, пасьпяшайся на ўспамогу мне!
15 Няхай асаромяцца і будуць у ганьбе ўсе, што шукаюць душы маёй, каб зьнішчыць яе; няхай
адступяцца і будуць у сораме тыя, якім даспадобы ліхоцьце маё.
16 Няхай аслупянеюць у сораме сваім тыя, якія кажуць мне: «Ага, ага!»

17 Няхай радуюцца і весяляцца ў Табе ўсе, хто шукае Цябе. Няхай кажуць заўсёды тыя, што
любяць выратаваньне Тваё: «Будзь узьвялічаны, ГОСПАДЗЕ!»
18 Хоць я бедны і прыгнечаны, Госпад мой клапоціцца пра мяне. Ты — успамога мая і ратунак
мой! Не затрымлівайся, Божа мой!

Пс 41

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Шчасьлівы той, хто гаротных разумее; у дзень ліхі ГОСПАД збавіць яго.
3 ГОСПАД захавае яго і дасьць яму жыць; ён будзе шчасьлівы на зямлі, і Ты не аддасі яго на
волю ворагаў ягоных.
4 ГОСПАД умацуе яго на ложку немачы; увесь ложак ягоны Ты пераменіш у немачы ягонай.
5 Я сказаў: «ГОСПАДЗЕ, зьлітуйся нада мною! Вылечы душу маю, бо я саграшыў перад Табою».
6 Ворагі мае кажуць ліхое пра мяне: «Калі ж ён памрэ, і будзе зьнішчана імя ягонае?»
7 І калі хто прыйдзе пабачыць мяне, гаворыць марнае, сэрца ягонае напаўняецца
зласьлівасьцю, і як выйдзе, гаворыць [гэта].
8 Разам [сабраўшыся], шэпчуцца супраць мяне тыя, што ненавідзяць мяне, выдумляючы ліхое
на мяне:
9 «Слова Бэліяла вылілася на яго; калі ён зьлёг, больш ня ўстане!»
10 Нават чалавек супакою майго, на якога я спадзяваўся, які еў хлеб мой, падняў на мяне пяту.
11 А Ты, ГОСПАДЗЕ, зьлітуйся нада мною і падымі мяне, каб я аддаў ім [адплату]!
12 З таго я пазнаю, што Ты зычлівы да мяне, калі вораг мой радасна гукаць ня будзе,
13 але ў беззаганнасьці маёй Ты падтрымаеш мяне і паставіш мяне перад абліччам Тваім на
вякі.
14 Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, ад веку і на вякі. Амэн, амэн!

Пс 42

1 Кіраўніку хору. Навучаньне сыноў Караха.
2 Як лань прагне вады з ручая, так душа мая, Божа, прагне Цябе!
3 Душа мая прагне Бога, Бога Жывога! Калі ж я прыйду і ўбачу аблічча Бога?
4 Сьлёзы мае былі хлебам маім дзень і ноч, калі да мяне гаварылі ўвесь дзень: «Дзе Бог твой?»
5 Успамінаючы гэта, я душу маю выліваю, бо хадзіў я ў грамадзе шматлюднай, вядучы яе ў
Дом Божы з голасам радасьці і падзякі мноства сьвяточнага.
6 Чаму ты сумуеш, душа мая? Чаму ў-ва мне ты трывожышся? Спадзявайся на Бога, бо яшчэ
будзеш славіць Яго, збаўленьне аблічча майго і Бога майго.
7 Душа сумуе ў-ва мне; дык з зямлі Ярданскай, з гор Гермону, з гары Міцар я пра Цябе
ўспамінаю.
8 Бяздоньне гукае бяздоньню пры шуме Тваіх вадаспадаў; усе воды Твае і ўсе хвалі Твае
прайшлі праз мяне.
9 Удзень ГОСПАД зьявіць міласэрнасьць Сваю, а ўначы сьпеў Ягоны будзе са мною, малітва да
Бога жыцьця майго.
10 Да Бога кажу я: «Скала мая! Чаму Ты забыўся пра мяне? Чаму я ў суме хаджу ад уціску
ворагаў?»
11 Як рана ў костках маіх, зьневажалі мяне ворагі мае, гаворачы мне ўвесь дзень: «Дзе Бог
твой?»
12 Чаму ты сумуеш, душа мая? Чаму ў-ва мне ты трывожышся? Спадзявайся на Бога, бо яшчэ
будзеш славіць Яго, збаўленьне аблічча майго і Бога майго!

Пс 43

1 Судзі мяне, Божа, і барані мяне ў справе маёй супраць народу небагабойнага! Ад чалавека
крывадушнага і беззаконнага збаў Ты мяне!
2 Бо Ты — Бог мой, апора мая. Чаму Ты пакінуў мяне? Чаму я ў суме хаджу ад уціску ворагаў?

3 Спашлі сьвятло Тваё і праўду Тваю, каб вялі мяне і прывялі на гару сьвятую Тваю і да сялібы Тваёй,
4 каб я прыйшоў да ахвярніка Божага, да Бога радасьці і пацяшэньня майго, і на гусьлях буду
славіць Цябе, Божа, мой Божа!
5 Чаму ты сумуеш, душа мая? Чаму ў-ва мне ты трывожышся? Бо яшчэ будзеш славіць Яго,
збаўленьне аблічча майго і Бога майго!

Пс 44

1 Кіраўніку хору. Сыноў Караха. Навучаньне.
2 Божа! Вушамі нашымі мы чулі, бацькі нашыя нам абвясьцілі пра справы, якія Ты ўчыніў у
дні іхнія, у дні старадаўнія.
3 Ты рукою Тваёю вырваў паганаў, а іх пасадзіў; вынішчыў народы, а іх разрасьціў.
4 Бо не мячом сваім яны ўзялі на ўласнасьць зямлю, не рамяно іхняе збавіла іх, але правіца
Твая і рамяно Тваё, і сьвятло аблічча Твайго, бо Ты меў ласку да іх.
5 Ты — Валадар мой, о Божа! Дык загадай, [каб прыйшло] збаўленьне Якубу!
6 Праз Цябе мы паб'ем прыгнятальнікаў нашых, праз імя Тваё стопчам тых, што паўстаюць
супраць нас.
7 Бо не на лук спадзяюся я, і меч мой ня збавіць мяне,
8 але Ты збавіў нас ад прыгнятальнікаў нашых і асароміў тых, што нас ненавідзяць.
9 У Богу мы хвалімся ўсе дні, і імя Тваё навекі будзем славіць! (Сэлях)
10 Але Ты нас пакінуў і нас асароміў, і не выходзіш разам з войскамі нашымі.
11 Ты павярнуў нас наўцёкі перад прыгнятальнікамі нашымі, а ненавісьнікі нашыя нас
зрабавалі.
12 Ты нас аддаў, як авечак, каб нас паелі, і расьцярушыў нас між паганаў.
13 Ты прадаў народ Твой за марную плату і не падняў кошту яго.
14 Ты выставіў нас на ганьбаваньне суседзям нашым, на кпіны і насьмешкі тых, што навокал
нас.
15 Ты ў прыказку ўвёў нас сярод паганаў, і народы ківаюць галовамі [над намі].
16 Увесь дзень ганьба мая перада мною, і сорам аблічча майго пакрывае мяне
17 бо [чую] голас тых, якія зьневажаюць і лаюць мяне, бо [бачу] аблічча ворага і мсьціўцы.
18 Усё гэта прыйшло на нас, хоць мы не забыліся на Цябе і ня здрадзілі запавету з Табою.
19 Не адступілася сэрца нашае і не адхіляліся крокі нашыя ад шляху Твайго,
20 хоць Ты скрышыў нас у месцы цмокаў і накрыў нас ценем сьмерці.
21 Калі б мы забыліся імя Бога нашага і цягнулі рукі нашыя да бога чужога,
22 ці ж бы Бог не дазнаўся пра гэта? Бо Ён ведае таямніцы сэрца!
23 Бо за Цябе забіваюць нас увесь дзень, лічаць нас за авечак на зарэз.
24 Збудзіся! Чаму сьпіш, Госпадзе? Абудзіся, не пакінь нас навекі!
25 Чаму Ты хаваеш аблічча Тваё, забываешся на пакуты і прыгнечаньне нашае?
26 Бо ўкінута ў пыл душа нашая, прыляпілася да зямлі нутро нашае.
27 Паўстань на ўспамогу нам, выбаў нас дзеля міласэрнасьці Тваёй!

Пс 45

1 Кіраўніку хору: на лад "Лілеі". Сыноў Караха. Навучаньне. Песьня вясельная.
2 Сэрца маё пераліваецца словамі добрымі. Я расказваю твор мой пра Валадара. Язык мой —
як пёрка спраўнага пісара.
3 Ты прыгажэйшы за ўсіх сыноў чалавечых, ласка ліецца з вуснаў Тваіх! Таму дабраславіў Цябе
Бог на вякі.
4 Падпержы, Волаце, паясьніцу мячом Тваім, славай Тваёй і веліччу Тваёй!
5 І ў велічы Тваёй мей посьпех, сядзь [пераможна] са словам праўды і лагоднай праведнасьці,
і правіца Твая няхай навучыць цябе страху [Божаму].
6 Стрэлы Твае вострыя, народы ўпадуць пад [ногі] Твае, яны [скіраваныя] ў сэрцы ворагаў
Валадара.

7 Пасад Твой, Божа, на вякі вечныя! Кій роўнасьці — кій валадарства Твайго.
8 Ты палюбіў праведнасьць і ўзьненавідзеў бязбожнасьць. Дзеля гэтага памазаў Цябе, Божа,
Бог Твой, алеем радасьці больш за таварышаў Тваіх.
9 Усё адзеньне Тваё — [быццам] міра, альвас і касья; у палацы з косьці слановае [граньне] на
струнах вяселіць Цябе.
10 Дочкі валадароў сярод шанаваных Тваіх; сужонка Валадара стаіць праваруч Цябе ў шчырым
золаце з Афіру.
11 «Слухай, дачка, і ўзглянь, і прыхілі вуха тваё, і забудзься пра народ твой і пра дом бацькі
твайго.
12 І калі Валадар прыгажосьці тваёй зажадае, ты схіліся перад Ім, бо Ён — Госпад твой».
13 І дачка Тыру з дарам [прыйдзе] перад аблічча тваё, панізяцца багатыя народу.
14 Уся аздоба дачкі валадара ўнутры, золатам апраўлены шаты яе.
15 У вопратках рознакаляровых вядуць яе да Валадара; дзяўчыны [ідуць] за ёю, сяброўкі ейныя
ідуць да цябе.
16 Іх вядуць у радасьці і вясёласьці, і ўваходзяць яны ў палац Валадара.
17 Замест бацькоў Тваіх будуць сыны Твае; іх паставіш князямі па ўсёй зямлі.
18 Я зраблю памятным імя Тваё з пакаленьня ў пакаленьне; таму народы будуць славіць Цябе
на вякі вечныя.

Пс 46

1 Кіраўніку хору. Сыноў Караха. На аламот. Сьпеў.
2 Бог для нас — прыстанішча і моц, у бядзе ўспамога, якая заўсёды прыходзіць.
3 Дык ня будзем баяцца, хоць бы захісталася зямля і горы рушылі ў сэрца мора,
4 хоць бы раўлі і ўздымаліся воды ягоныя, хоць бы трэсьліся горы ад шалу яго. (Сэлях)
5 [Вось] рака, струмяні ейныя радуюць горад Божы, сьвятую сялібу Найвышэйшага.
6 Бог пасярод яго, дык ён не захістаецца; Бог дапаможа яму, як настане раніца.
7 Зараўлі народы, захісталіся валадарствы; Ён выдаў голас Свой, і зямля растапілася.
8 ГОСПАД Магуцьцяў з намі, умацаваны замак наш — Бог Якуба. (Сэлях)
9 Прыйдзіце, пабачце дзеі ГОСПАДА, якое спусташэньне Ён зрабіў на зямлі,
10 Ён войны спыняе аж да краю зямлі, крышыць лукі і дзіды расьсякае, калясьніцы паліць у
агні.
11 «Спыніцеся, пазнайце, што Я — Бог! Я буду ўзьвялічаны між народамі, буду ўзьвялічаны на
зямлі!»
12 ГОСПАД Магуцьцяў з намі, умацаваны замак наш — Бог Якуба! (Сэлях)

Пс 47

1 Кіраўніку хору. Сыноў Караха. Псальм.
2 Усе народы, пляскайце рукамі, усклікайце Богу голасам радасьці!
3 Бо страшны ГОСПАД Найвышэйшы, Валадар вялікі над усёй зямлёю.
4 Ён скарыў народы, і [кінуў] паганаў пад ногі нашыя.
5 Ён выбраў для нас спадчыну нашую, гонар Якуба, якога Ён палюбіў. (Сэлях)
6 Узьняўся Бог з гукам гучным, ГОСПАД [узьняўся] пры голасе трубы.
7 Выслаўляйце Бога, выслаўляйце! Выслаўляйце Валадара нашага, выслаўляйце!
8 Бо Валадар над усёй зямлёй — [гэта] Бог; выслаўляйце [Яго] з разуменьнем.
9 Валадарыць Бог над усімі народамі; Бог сядзіць на пасадзе сьвятасьці Сваёй.
10 Магнаты народаў сабраліся разам з народам Бога Абрагама, бо шчыты зямлі — Божыя; Ён
высока ўзьняты.

Пс 48

1 Сьпеў. Псальм сыноў Караха.
2 Вялікі ГОСПАД і вельмі хвалёны ў горадзе Бога нашага, на гары сьвятасьці Сваёй.

3 Прыгожае ўзьнясеньне, аздоба ўсёй зямлі, гара Сыён на схілах паўночных, горад вялікага
Валадара.
4 Бог у палацах ягоных вядомы як умацаваны замак [яго].
5 Бо вось, валадары сабраліся, падыйшлі грамадою,
6 але, угледзеўшы, аслупянелі, спалохаліся, зьбянтэжыліся.
7 Дрыжаньне ахапіла іх, болі, як у жанчыны, што нараджае.
8 Ты ветрам усходнім скрышыў караблі з Таршышу.
9 Як чулі мы гэта, гэтак і бачылі ў горадзе ГОСПАДА Магуцьцяў, у горадзе Бога нашага. Бог
умацаваў яго на вякі. (Сэлях)
10 Мы разважаем, Божа, пра міласэрнасьць Тваю пасярод сьвятыні Тваёй.
11 Як імя Тваё, Божа, так і хвала Твая — аж да ўзьмежкаў зямлі; правіца Твая напоўнена
праведнасьцю.
12 Весяліцца гара Сыён, радуюцца дочкі Юды дзеля судоў Тваіх.
13 Станьце наўкола Сыёну, абыйдзіце вакол яго, палічыце вежы ягоныя,
14 прылажыце сэрца сваё да валоў ягоных, агледзьце палацы ягоныя, каб абвясьціць
пакаленьням, якія будуць,
15 што гэты Бог ёсьць Бог наш на вякі вечныя, і Ён будзе весьці нас аж да сьмерці.

Пс 49

1 Кіраўніку хору. Сыноў Караха. Псальм.
2 Чуйце гэта, усе народы! Прыхіліце вуха, усе жыхары веку гэтага!
3 Як сыны паспалітыя, так і сыны знакамітыя, разам багатыя і бедныя.
4 Вусны мае кажуць мудрасьць, і думкі сэрца майго разважлівыя.
5 Прыхілю да прыповесьці вуха маё, выяўлю пры [гуках] гусьляў загадку маю.
6 Навошта мне баяцца ў дні няшчасьця, калі атачыла мяне беззаконьне тых, якія нападаюць
на мяне,
7 якія спадзяюцца на сілу сваю і мноствам багацьця свайго хваляцца?
8 Ніхто выбавіць брата ня можа і даць за яго выкуп Богу,
9 бо вельмі дарагая цана за душу ягоную, і зрачыся гэтага [мусіць] на вякі,
10 каб ён жыў заўсёды і ня ўбачыў парахненьня.
11 Бо [кожны] бачыць: мудрыя паміраюць, дурны і шалёны разам прападаюць, і пакідаюць
іншым багацьце сваё.
12 Думкі іхнія пра тое, што дамы іхнія на вякі, сялібы іхнія — з пакаленьня ў пакаленьне, і яны
сваім імем назвалі [цэлыя] землі.
13 Але чалавек у славе [доўга] трываць ня будзе, ён падобны да скаціны, якая гіне.
14 Гэткі шлях іхні, тых, якія спадзяюцца на сябе, і тых, якім [словы] вуснаў іхніх даспадобы.
(Сэлях)
15 Як авечкі, у пекла яны зыйдуць, сьмерць пасьвіць іх будзе, і раніцаю правыя будуць мець
уладу над імі, сіла іхняя ссохне, пекла — жытло іхняе.
16 Але Бог выбавіць душу маю з рукі пекла, бо Сам возьме мяне. (Сэлях)
17 Ня бойся, калі хто багацее, калі множыцца слава дому ягонага,
18 бо, калі памрэ, нічога ня возьме з сабою, і слава ягоная ня пойдзе за ім.
19 Хоць бы за жыцьця свайго душу сваю ён дабраслаўляў, і хвалілі яго, калі добра рабіў для
сябе,
20 ён пойдзе за пакаленьнем бацькоў сваіх, што ня ўбачаць ніколі сьвятла.
21 Чалавек у славе і без разуменьня падобны да скаціны, якая гіне.

Пс 50

1 Псальм Асафа. Бог багоў, ГОСПАД прамовіў і кліча зямлю ад усходу сонца да захаду яго.
2 З Сыёну, вяршыні прыгажосьці, зазьзяў Бог.

3 Прыйдзе Бог наш і ня будзе маўчаць, перад абліччам Ягоным агонь палючы, навакол Яго —
бура вялізарная.
4 Ён кліча неба, што ўверсе, і зямлю на суд народу Свайго:
5 «Зьбярыце да Мяне багабойных Маіх, якія заключылі запавет са Мною пры ахвяры!»
6 І будуць тады нябёсы апавядаць пра праведнасьць Ягоную, бо Сам Бог [ёсьць] Судзьдзя.
(Сэлях)
7 «Слухай, народзе Мой, і Я буду гаварыць. Ізраілю, Я буду сьведчыць супраць цябе. Бог, твой
Бог — гэта Я!
8 Не за ахвяры твае Я буду вінаваціць цябе, цэласпаленьні твае перада Мною заўсёды!
9 Не вазьму Я быкоў з дому твайго, ані казлоў з абораў тваіх,
10 бо Мае ўсе зьвяры лясныя і скаціна, што тысячамі [ходзіць] па гарах.
11 Я ведаю ўсіх птушак у гарах, і зьвяры палявыя — у Мяне.
12 Калі б Я згаладаўся, табе б Я не сказаў, бо Мой сусьвет і тое, што напаўняе яго.
13 Ці ж Я ем мяса валоў і п'ю кроў казлоў?
14 Ахвяруй падзяку Богу, і споўні перад Найвышэйшым абяцаньні твае.
15 І кліч Мяне ў дзень трывогі, Я выратую цябе, і будзеш ушаноўваць Мяне».
16 А да бязбожніка сказаў Бог: «Навошта ты пералічваеш пастановы Мае, узьнімаеш запавет
Мой да вуснаў тваіх,
17 і ненавідзіш настаўленьне, і словы Мае за сябе кідаеш?
18 Калі бачыш злодзея, маеш упадабаньне ў ім, і з чужаложнікамі частка твая.
19 Вусны твае ты расчыняеш на злое, і язык твой кнуе падступнае.
20 Ты сядзіш і супраць брата твайго гаворыш, абмаўляеш сына маці тваёй.
21 Гэтак ты рабіў, а Я маўчаў. Дык здалося табе, што Я такі самы, як ты! Але Я буду караць цябе
і пастаўлю [справы твае] перад вачыма тваімі».
22 Зважайце цяпер на гэта вы, што Бога забываеце, каб Я не схапіў [вас], бо ня будзе каму
вызваліць.
23 Хто ахвяруе падзяку, той ушаноўвае Мяне, і хто парадкуе шлях свой, таму Я пакажу
збаўленьне Божае.

Пс 51

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда,
2 калі прарок Натан прыйшоў да яго пасьля таго, як ён увайшоў да Батшэвы.
3 Зьлітуйся нада мною, Божа, паводле міласэрнасьці Тваёй, і праз вялікую літасьць Тваю даруй
правіны мае!
4 Абмый мяне ўсяго ад беззаконьня майго і ачысьці мяне ад грэху майго.
5 Бо я ведаю правіну маю, і грэх мой перада мною заўсёды.
6 Супраць Цябе, толькі супраць Цябе саграшыў я і ліхое ўчыніў перад вачыма Тваімі, бо Ты
праведны ў словах Тваіх і чысты ў судзе Тваім.
7 Вось, я ў беззаконьні нарадзіўся, і ў грэху зачала мяне маці мая.
8 Вось, Табе даспадобы праўда ў нутры, дык дай мне пазнаць мудрасьць у сэрцы маім.
9 Акрапі мяне ізопам, каб я ачысьціўся; абмый мяне, каб я стаўся бялейшым за сьнег.
10 Дай мне пачуць радасьць і вясёласьць, каб узьвесяліліся косткі, якія Ты скрышыў.
11 Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і прабач мне ўсе беззаконьні мае.
12 Сэрца чыстае стварыў ў-ва мне, Божа, і дух упэўнены аднаві ў-ва мне.
13 Не адкінь Ты мяне ад аблічча Твайго і Духа Сьвятога Твайго не забірай у мяне!
14 Вярні мне радасьць збаўленьня Твайго, і духам шляхетным падтрымай мяне,
15 і я буду навучаць адступнікаў шляхам Тваім, і грэшнікі вернуцца да Цябе.
16 Вызваль мяне ад [віны] за кроў, Божа, Бог выратаваньня майго, і язык мой будзе крычаць
пра праведнасьць Тваю.
17 Адчыні, Госпадзе, вусны мае, і вусны мае будуць абвяшчаць хвалу Тваю.
18 Бо Ты не жадаеш ахвяраў, хоць бы я іх даў, і цэласпаленьні не даспадобы Табе.

19 Ахвяра для Бога — скрышаны дух; сэрцам скрышаным і зламаным Ты, Божа, не пагарджаеш!
20 Рабі добрае Сыёну паводле ласкі Тваёй, збудуй муры Ерусаліму.
21 Тады будуць Табе даспадобы ахвяры праведнасьці, цэласпаленьні і ахвяры дасканалыя; тады быкоў узьнясуць на ахвярнік Твой.

Пс 52

1 Кіраўніку хору. Навучаньне Давіда,
2 калі прыйшоў Даэг Эдомец, і паведаміў Саўлу, і сказаў яму: «Давід прыйшоў у дом Абімэлеха».
3 Навошта хвалішся злачынствам, волаце? Міласэрнасьць Божая кожны дзень [трывае]!
4 Загубу выдумляе язык твой; як брытва вострая той, які здраду ўчыняе!
5 Ты любіш ліхое больш, чым добрае; хлусьню гаворыш, а ня тое, што праведнае. (Сэлях)
6 Любіш усе словы згубныя, о, язык падступны.
7 Дзеля гэтага Бог скрышыць цябе назаўсёды, схопіць цябе, і вырве цябе з намёту, і выкараніць цябе з зямлі жывых. (Сэлях)
8 І ўбачаць праведнікі, і будуць баяцца, і будуць сьмяяцца з яго:
9 «Вось чалавек, які ня Бога меў сабе апорай, і спадзяваўся на мноства багацьця свайго, і ўмацоўваўся ў зласьлівасьці сваёй».
10 А я, як аліўка зялёная ў Доме Божым, спадзяюся на міласэрнасьць Божую на вякі вечныя.
11 Буду славіць Цябе на вякі за тое, што Ты ўчыніў, і буду спадзявацца на імя Тваё, бо Ты добры адносна багабойных Тваіх.

Пс 53

1 Кіраўніку хору: на лад сумны. Навучаньне Давіда.
2 Сказаў бязглузды ў сэрцы сваім: «Няма Бога!» Сапсаваліся яны і агідныя рэчы робяць, няма таго, хто робіць дабро.
3 Бог глянуў з неба на сыноў чалавечых, каб пабачыць, ці ёсьць разумны, які Бога шукае.
4 Усе адступіліся, усе разам нягодныя; няма нікога, хто робіць дабро, няма аніводнага!
5 Няўжо ня маюць пазнаньня ўсе злачынцы, якія народ мой зьядаюць, быццам хлеб ядуць, і Бога ня клічуць?
6 Там яны будуць у страху вялікім, дзе няма страху, бо Бог раскідае косткі тых, якія паставілі табар [супраць] цябе, і ты асароміш іх, бо Бог іх адкінуў.
7 Хто дасьць збаўленьне з Сыёну для Ізраіля? Калі Бог верне палонных народу Свайго, будзе радавацца Якуб і будзе весяліцца Ізраіль!

Пс 54

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Навучаньне Давіда,
2 калі прыйшлі Зіфеі і сказалі Саўлу: «Ці ж гэта не Давід схаваўся ў нас?»
3 Божа, імем Тваім збаў мяне, і магутнасьцю Тваёю вядзі справу маю!
4 Божа, пачуй малітву маю, прыхілі вуха да словаў вуснаў маіх!
5 Бо чужынцы паўсталі супраць мяне, і моцныя шукаюць душы маёй; яны ня маюць Бога перад сабою. (Сэлях)
6 Вось, Бог — дапамога мая; Госпад падтрымлівае душу маю.
7 Зьвяртаючыся, зьвернецца ліха на ворагаў маіх. У праўдзе Тваёй Ты вынішчы іх!
8 Тады ахвотна буду складаць ахвяры Табе; буду славіць імя Тваё, ГОСПАДЗЕ, бо Ты — добры!
9 Бо Ты вызваліў мяне ад усіх трывогаў, і на [загубу] ворагаў маіх глядзелі вочы мае.

Пс 55

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Навучаньне Давіда.
2 Прыхілі вуха, Божа, да малітвы маёй і не хавайся ад маленьня майго!
3 Зваж на мяне і адкажы мне; я стогну ў тузе маёй і енчу

4 ад голасу ворага, ад уціску бязбожніка, бо злачынства закідаюць мне і ў гневе змагаюцца са
мною.
5 Сэрца маё трапеча ў-ва мне, і жахі сьмерці напалі на мяне;
6 страх і дрыжаньне прыйшлі на мяне, і трывога ахапіла мяне.
7 І я сказаў: «Хто дасьць мне крылы, як у голуба! Я паляцеў бы і супачыў!
8 Вось, уцёк бы далёка і жыў бы ў пустыні». (Сэлях)
9 Я б сьпяшаўся, каб схавацца перад ветра віхурай, перад бурай!
10 Вынішчы іх, Госпадзе, падзялі мову ім, бо я бачыў крыўды і спрэчкі ў горадзе.
11 Дзень і ноч яны ходзяць па мурах ягоных наўкола, злачынства і ліхоцьце ў сярэдзіне яго.
12 Загуба ў сярэдзіне яго, і не зыходзяць з плошчаў ягоных ашуканства і здрада.
13 Бо ня вораг мяне зьневажае, я дараваў бы [гэта], ня той, што мяне ненавідзіць,
узьвялічваецца супраць мяне, ад яго б я схаваўся,
14 але ты, чалавек, як я, сябра мой і знаёмы мой,
15 з якім мы разам вялі шчырыя гутаркі, з якім у Дом Божы хадзілі ў грамадзе.
16 Няхай, зьнішчаючы, зьнішчыць іх сьмерць! Няхай зыйдуць жывыя ў пекла, бо ліхота [жыве]
ў вандраваньні іхнім, у нутры іхнім.
17 А Я буду клікаць да Бога, і ГОСПАД збавіць мяне.
18 Увечары, і раніцаю, і ў белы дзень я буду енчыць і галасіць, і Ён пачуе голас мой.
19 Ён выбавіць душу маю, каб даць супакой ад [тых, што] варагуюць супраць мяне, бо шмат
было тых, якія супраць мяне.
20 Пачуе Бог, і ўпакорыць іх Той, Які жыве спрадвеку. (Сэлях) Бо няма ў іх паправы, і яны не
баяцца Бога,
21 руку сваю выцягваюць на тых, што з імі ў супакоі жылі, і парушаюць запавет свой;
22 гладкія, як тое масла, вусны ягоныя, а ў сэрцы — варожасьць; словы ягоныя лагаднейшыя
за алей, але яны — мячы аголеныя.
23 Ускладзі бярэмя тваё на ГОСПАДА, і Ён паклапоціцца пра цябе; ня дасьць Ён ніколі, каб
пахіснуўся праведнік.
24 І Ты, Божа, іх кінеш у ямы парахненьня; людзі крыважэрныя і падступныя не [дажывуць]
паловы дзён сваіх. А я на Цябе спадзяюся!

Пс 56

1 Кіраўніку хору: на лад “Галубка бязмоўная ў мясьцінах далёкіх”. Залатая песьня Давіда, калі
яго ў Гаце схапілі Філістынцы.
2 Зьлітуйся нада мною, Божа, бо прагне праглынуць мяне чалавек; усякі дзень нападаючы,
уціскае мяне.
3 Прагнуць праглынуць мяне ворагі мае ўвесь дзень, бо шмат іх ваюе супраць мяне,
Найвышэйшы!
4 У дзень, калі я баюся, я спадзяюся на Цябе.
5 У Богу буду хваліцца словам Ягоным. На Бога я спадзяюся, ня буду баяцца. Што цела можа
зрабіць мне?
6 Штодзень яны перакручваюць словы мае; супраць мяне ўсе думкі іхнія, [каб учыніць мне]
зло.
7 Яны зьбіраюцца і хаваюцца, яны высочваюць сьляды мае, бо цікуюць на душу маю.
8 Дзеля злачынства [іхняга будзь] выратаваньнем для мяне, у гневе [Тваім] адкінь народы,
Божа!
9 Туляньне маё Ты мне залічыў. Зьбяры сьлёзы мае ў мяхі Твае, бо яны [запісаныя] ў кнізе
Тваёй!
10 Тады павернуць наўцёкі ворагі мае ў дзень, калі паклічу. Я ведаю, што Бог са мною!
11 У Богу буду хваліцца словам, у ГОСПАДЗЕ буду хваліцца словам [Ягоным].
12 На Бога я спадзяюся, ня буду баяцца. Што можа зрабіць мне чалавек?
13 На мне, Божа, абяцаньні Твае, дык прынясу падзяку Табе,

14 бо Ты вызваліў душу маю ад сьмерці і стопы мае ад падзеньня, каб хадзіў я перад абліччам
Бога ў сьвятле жывых.

Пс 57

1 Кіраўніку хору: на лад: “Не загубляй!” Залатая песьня Давіда, калі ён уцякаў ад аблічча
Саўла ў пячору.
2 Зьлітуйся нада мною, Божа, зьлітуйся нада мною! Бо ў Табе мае надзею душа мая, і ў ценю
крылаў Тваіх буду хавацца, пакуль не міне загуба.
3 Буду клікаць да Бога Найвышэйшага, да Бога, Які выканае [справу маю] для мяне.
4 Ён спашле з неба і збавіць мяне ад зьнявагаў таго, хто хоча мяне праглынуць. (Сэлях) Спашле
Бог міласэрнасьць Сваю і праўду Сваю.
5 Душа мая між ільвоў, я ляжу сярод тых, што палаюць агнём, сярод сыноў чалавечых. Зубы
іхнія — дзіды і стрэлы, языкі іхнія — мячы вострыя.
6 Узьвялічся па-над неба, Божа, па-над усёй зямлёй [няхай будзе] слава Твая.
7 Яны наставілі сетку дзеля стопаў маіх, прыгнялі душу маю, яны капалі яму перад абліччам
маім, але [самі] ўваліліся ў яе. (Сэлях)
8 Умацаванае сэрца маё, Божа, умацаванае сэрца маё, буду сьпяваць і выслаўляць [Цябе].
9 Збудзіся, слава мая! Збудзіцеся, псалтыр і гусьлі! Я пабуджу сьвітаньне.
10 Буду славіць Цябе сярод людзей, Госпадзе, буду выслаўляць Цябе сярод народаў,
11 бо аж да неба вялікая міласэрнасьць Твая, і праўда Твая — да аблокаў.
12 Узьвялічся па-над неба, Божа, па-над усёй зямлёй [няхай будзе] слава Твая!

Пс 58

1 Кіраўніку хору: на лад: “Не загубляй!” Залатая песьня Давіда.
2 Ці сапраўды маўчаньнем прамаўляеце праведна? Ці справядліва судзіце сыноў чалавечых?
3 Але ж у сэрцы вы ўчынілі беззаконьне, злачынствы рук вашых на зямлі ўзважылі.
4 Ад улоньня [маці] адступіліся [ад Бога] бязбожнікі, блукаюць ад нараджэньня тыя, якія
кажуць хлусьню.
5 Атрута іхняя — як атрута зьмяі, гадзюкі глухой, што вушы свае затыкае
6 і ня чуе голасу шаптуна, які заклінаць заклёнамі ўмее.
7 Божа, скрышы зубы іхнія ў вуснах іхніх! Выбі іклы львянятам, ГОСПАДЗЕ!
8 Няхай зьнікнуць яны як вада, што разьлілася; няхай, калі будуць нацягваць [лук], паломяцца
стрэлы іхнія!
9 Няхай як сьлімак, што ледзьве паўзе, яны счэзнуць! Няхай як спарон жанчыны яны сонца ня
ўбачаць!
10 Перш, чым катлы вашыя адчуюць [агонь ад] цярніны, няхай раскідае бура [цярніну], ці
сьвежую, ці распаленую.
11 Узрадуецца праведнік, калі ўбачыць помсту; ён абмые стопы свае ў крыві бязбожнікаў!
12 І скажа [кожны] чалавек: «Сапраўды, ёсьць плод у праведніка! Сапраўды, ёсьць Бог, Які
судзіць на зямлі!»

Пс 59

1 Кіраўніку хору: на лад “Не загубляй!” Залатая песьня Давіда, калі Саўл паслаў пільнаваць
дом [ягоны], каб яго забіць.
2 Выратуй мяне ад ворагаў маіх, Божа мой! Ад тых, што паўстаюць супраць мяне, абарані
мяне.
3 Выратуй мяне ад злачынцаў і збаў мяне ад людзей крывавых.
4 Бо вось, яны пільнуюць у засадзе душу маю, зьбіраюцца супраць мяне моцныя, і не за правіну
маю, і не за грэх мой, ГОСПАДЗЕ!
5 Без [ніякай] віны маёй яны зьбягаюцца і шыхтуюцца [супраць мяне]. Збудзіся, выйдзі на
спатканьне мне і паглядзі!

6 Ты Сам, ГОСПАДЗЕ, Бог Магуцьцяў, Бог Ізраіля, абудзіся, каб наведаць усе народы! Ня мей
літасьці для ўсіх ліхадзеяў і злачынцаў! (Сэлях)
7 Увечары яны вяртаюцца, выюць, быццам сабакі, і горад абыходзяць наўкола.
8 Вось, пена [спадае] з пашчаў іхніх, у вуснах іхніх — мячы, бо [кажуць яны]: "Хто гэта чуе?"
9 Але Ты, ГОСПАДЗЕ, будзеш сьмяяцца з іх, Ты будзеш кпіць з усіх паганаў!
10 Моц Тваю буду шукаць у Табе, бо Бог — умацаваны замак мой!
11 Бог, Які міласэрны да мяне, у міласэрнасьці Сваёй сустрэне мяне; Бог дасьць мне ўгледзець
[перамогу] над ворагамі маімі.
12 Не забівай іх, каб не забыўся народ мой! Захістай іх сілаю Тваёй і павалі іх, Госпадзе, шчыце
наш!
13 Грэх вуснаў іхніх — словы на губах іхніх. Няхай яны будуць злоўлены ў фанабэрыстасьці
сваёй за праклёны і ману, якія абвяшчаюць.
14 Зьнішчы іх у ярасьці, зьнішчы, няхай іх ня будзе, і няхай ведаюць, што Бог у Якубе пануе да
канцоў зямлі! (Сэлях)
15 Увечары яны вяртаюцца, выюць, быццам сабакі, і горад абыходзяць наўкола.
16 Бадзяючыся, бадзяюцца яны, каб што зьесьці; і не насыціўшыся, будуць жыць.
17 А я буду сьпяваць пра моц Тваю і раніцаю буду радавацца дзеля міласэрнасьці Тваёй, бо Ты
стаўся для мяне ўмацаваным замкам і прытулкам у дзень уціску майго.
18 Сіла мая, Цябе буду выслаўляць, бо Ты, Божа — умацаваны замак мой, Бог мой міласэрны!

Пс 60

1 Кіраўніку хору: на лад: “Лілея сьведчаньня”. Залатая песьня Давіда. Дзеля навучаньня,
2 калі ён змагаўся з Арам-Нагараім і з Арам-Цова, і калі Ёаў, варочаючыся, пабіў Эдом у Саляной
даліне, дванаццаць тысячаў.
3 Божа, Ты нас пакінуў, нас раструшчыў! Ты разгневаўся, вярніся зноў да нас!
4 Ты затрос зямлёю, рашчапіў яе; вылячы разломы ейныя, бо яна хістаецца!
5 Ты даў убачыць народу Твайму цяжкую долю, напаіў нас віном зьбянтэжанасьці.
6 Тым, што баяцца Цябе, Ты даў знак, каб уцяклі ад аблічча луку. (Сэлях)
7 Каб былі ўратаваныя ўмілаваныя Твае, збаў правіцай Тваёй і адкажы нам, і адкажы мне.
8 Бог сказаў у сьвятасьці Сваёй: «Я ўзрадуюся! Я падзялю Сыхем, і даліну Сукот разьмераю.
9 Мой Гілеад, і Мой Манаса, і Эфраім — моц галавы Маёй; Юда — заканадаўца Мой!
10 Мааў — міса для мыцьця Майго; на Эдом кіну сандалы Мае, радасна гукай дзеля Мяне,
[зямля] Філістынская».
11 Хто ўвядзе мяне ў горад умацаваны? Хто завядзе мяне ў Эдом?
12 Ці ж ня Ты, Божа, нас пакінуў і не выходзіш, Божа, з войскамі нашымі?
13 Дай нам успамогу ў прыгнечаньні [нашым], бо марны ратунак чалавечы.
14 З Богам мы зьявім сілу, і Ён растопча прыгнятальнікаў нашых.

Пс 61

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Давіда.
2 Пачуй, Божа, галашэньне маё, зваж на малітву маю!
3 Ад краю зямлі да Цябе клічу, калі зьнемагае сэрца маё; на скалу, што ўзвышаецца нада мною,
узьвядзі мяне!
4 Бо Ты быў прыстанішчам маім, вежай моцы маёй супраць ворага.
5 Буду жыць у намёце Тваім вечна, маю надзею пад заслонаю крылаў Тваіх. (Сэлях)
6 Бо Ты, Божа, чуў абяцаньні мае, Ты даў валоданьне тым, што баяцца імя Твайго.
7 Дадай дні да дзён валадара, няхай гады яго [будуць] з пакаленьня ў пакаленьне,
8 Няхай жыве вечна перад абліччам Божым; прызнач міласэрнасьць і праўду, каб захоўвалі
яго!
9 Дык буду выслаўляць імя Тваё на вякі, буду спаўняць абяцаньні мае кожны дзень.

Пс 62

1 Кіраўніку хору: на лад Едутуна. Псальм Давіда.
2 Толькі ў Богу супакойваецца душа мая, ад Яго збаўленьне маё.
3 Толькі Ён — скала мая і збаўленьне маё, умацаваны замак мой, дык я не пахіснуся.
4 Як доўга будзеце насядаць на чалавека? Вы ўсе [хочаце] забіць [яго], як тая сьцяна, што скранулася, як агароджа, што валіцца.
5 Яны толькі і радзяцца, як скінуць [яго] з высачыні; ім даспадобы няпраўда; яны вуснамі дабраслаўляюць, але ў нутры сваім праклінаюць! (Сэлях)
6 Толькі ў Богу супачынеш, душа мая, бо на Яго спадзяваньне маё.
7 Толькі Ён — скала мая і збаўленьне маё, умацаваны замак мой, дык не пахіснуся.
8 У Богу збаўленьне маё і слава мая; скала моцы маёй, прыстанішча маё ў Богу.
9 На Яго спадзявайся ў кожны час, народзе! Вылівайце перад абліччам Ягоным сэрцы вашыя, бо Бог — прыстанішча нашае. (Сэлях)
10 Сыны чалавечыя — толькі марнасьць, сыны людзкія — хлусьня; калі пакладзеш іх на шалі, яны разам лягчэй за марнасьць!
11 Не спадзявайцеся на крыўду, не марнейце ў зрабаваным, калі вам памножыцца багацьце, сэрца свайго да яго не прыкладайце!
12 Раз сказаў Бог, а я двойчы пачуў гэта, што сіла — у Бога.
13 І ў Цябе міласэрнасьць, Госпадзе, бо Ты даеш чалавеку паводле ўчынкаў ягоных.

Пс 63

1 Псальм Давіда, калі ён быў у пустыні Юдэйскай.
2 Божа! Ты — Бог мой! Цябе я шукаю, Цябе прагне душа мая, па Табе тужыць цела маё ў сухой і спрагнёнай зямлі, на бязводзьдзі.
3 Гэтак я ўглядаўся на Цябе ў сьвятасьці Тваёй, каб убачыць моц Тваю і славу Тваю.
4 Бо міласэрнасьць Твая лепшая за жыцьцё; вусны мае хваліць Цябе будуць.
5 Гэтак буду я дабраслаўляць Цябе ў жыцьці маім, у імя Тваё буду рукі мае ўзьнімаць.
6 Быццам тлушчам і тлустасьцю насычаецца душа мая, і сьпевам хвалы будуць хваліць Цябе вусны мае,
7 калі я на ложку маім пра Цябе ўспамінаю, калі ў часе варты [начной] пра Цябе разважаю.
8 Бо Ты быў успамогай мне, і ў ценю крылаў Тваіх буду весяліцца.
9 Прыляпілася да Цябе душа мая, падтрымлівае мяне правіца Твая.
10 А тыя, што шукаюць загубы душы маёй, пойдуць у глыбіні зямлі,
11 будуць аддадзены яны ў рукі мяча, стануцца здабычай шакалаў.
12 І валадар узрадуецца ў Богу; і будзе хваліцца кожны, хто Ім прысягае, бо будуць заткнёныя вусны таго, хто гаворыць хлусьню.

Пс 64

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Пачуй, Божа, голас мой у смутку маім! Ад страху [перад] ворагам захавай жыцьцё маё!
3 Схавай мяне ад таемных [намераў] злачынцаў, ад грамады тых, што чыняць нягоднае,
4 якія навастрылі як меч язык свой, нацягнулі [лук са] стрэламі сваімі — горкімі словамі,
5 каб страляць з засады ў беззаганнага; зьнянацку страляюць яны ў яго і не баяцца.
6 Яны ўмацоўваюць сябе ў справах ліхіх; змаўляюцца пастку [наставіць] таемна; яны кажуць: «Хто гэта ўбачыць?»
7 Яны шукаюць беззаконьня, мы гінем праз задумы беззаконныя! Бо нутро чалавека і сэрца — глыбокія [воды].
8 І стрэліць Бог у іх стралою, зьнянацку атрымалі яны ўдар,
9 і яны спатыкнуліся праз язык свой; і ўцякаюць усе, хто іх убачыў.
10 І будуць баяцца ўсе людзі, і будуць апавядаць пра справы Божыя, і будуць разважаць пра тое, што Ён учыніў.

11 Узрадуецца праведнік у ГОСПАДЗЕ і будзе мець надзею ў Ім, і будуць хваліць Яго ўсе шчырыя
сэрцам.

Пс 65

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда. Сьпеў.
2 Табе, Божа, прыналежыць хвала на Сыёне; і Табе будуць споўненыя абяцаньні.
3 Ты чуеш малітву, да Цябе ўсякае цела імкнецца.
4 Справы беззаконныя перамаглі мяне, але Ты дараваў нам правіны нашыя.
5 Шчасьлівы той, каго Ты выбраў і наблізіў, каб жыў ён на панадворках Тваіх; мы будзем
насычацца даброцьцем Дому Твайго, сьвятой сьвятыні Тваёй.
6 Страшнымі [ўчынкамі] ў праведнасьці Ты адказваеш нам, Божа збаўленьня нашага,
пэўнасьць усіх канцоў зямлі і далёкага мора,
7 Які ўгрунтаваў горы сілаю Сваёй, Які падперазаны магутнасьцю,
8 Які суцішае шум мора, шум хваляў ягоных і мноства народу.
9 І будуць баяцца знакаў Тваіх жыхары канцоў сьвету, землі на ўсходзе і на захадзе Ты
разьвесяляеш.
10 Ты наведаў зямлю і напаіў яе, Ты ўзбагаціў яе Божым струмянём, напоўненым водамі. Ты
прыгатаваў збожжа на ёй, бо гэтак угрунтаваў яе.
11 Ты насычаеш разоры яе і разраўноўваеш скібы яе, кроплямі дажджу разьмякчаеш яе,
парастак яе дабраслаўляеш.
12 Ты ўкаранаваў год дабром Тваім, і сьцежкі Твае разьліваюць тлустасьць,
13 разьліваюць на пашы ў пустыні, і ўзгоркі падпярэзваюцца радасьцю,
14 апранаюцца ў чароды авечак, і даліны атуляюцца збожжам, радасна гукаюць і сьпяваюць.

Пс 66

1 Кіраўніку хору. Сьпеў. Псальм. Радасна гукай для Бога, уся зямля!
2 Сьпявайце славу імя Ягонага, узносьце славу і хвалу Яму!
3 Кажыце да Бога: «Які Ты страшны ў дзеяньнях Тваіх! Дзеля вялікасьці моцы Тваёй
падпарадкоўваюцца Табе ворагі Твае.
4 Уся зямля паклоніцца Табе і будзе выслаўляць Цябе, будзе выслаўляць імя Тваё». (Сэлях)
5 Хадзеце і паглядзіце на дзеяньні Бога, страшнага ва ўчынках [Сваіх] адносна сыноў
чалавечых.
6 Ён перамяніў мора ў сухазем'е, праз раку мы перайшлі пехатою; там радаваліся мы ў Ім!
7 Ён пануе ў магутнасьці Сваёй на вякі; вочы Ягоныя сочаць за народамі, каб бунтаўнікі не
вывышаліся перад Ім. (Сэлях)
8 Дабраслаўляйце, народы, Бога нашага, і няхай будзе чутны голас хвалы Ягонай.
9 Ён дараваў жыцьцё душы нашай і ня даў пахіснуцца назе нашай.
10 Бо Ты выспрабаваў нас, Божа! Ачысьціў нас, як ачышчаецца срэбра.
11 Ты ўвёў нас у пастку, сьціснуў цяжкімі путамі сьцёгны нашыя.
12 Ты пасадзіў чалавека на галовы нашыя; мы прайшлі праз агонь і ваду, і Ты вывеў нас на
прастор.
13 Увайду ў Дом Твой з цэласпаленьнямі, споўню Табе абяцаньні мае,
14 якія прамовілі губы мае, і сказаў я вуснамі маімі ў бядзе маёй.
15 Цэласпаленьні з тлустых [авечак] прынясу Табе з дымам баранаў; дам [Табе] валоў і казлоў.
(Сэлях)
16 Хадзеце, паслухайце, і я раскажу ўсім, хто Бога баіцца, што Ён учыніў для душы маёй.
17 Да Яго я клікаў вуснамі маімі, і ўзьвялічваньне было на языку маім.
18 Калі б я глядзеў на нягоднае ў сэрцы маім, Госпад мяне б не пачуў!
19 Але Бог пачуў і зьвярнуў увагу [Сваю] на голас малітвы маёй.
20 Дабраслаўлёны Бог, Які не адкінуў малітвы маёй і міласэрнасьці Сваёй [не пазбавіў мяне]!

Пс 67

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Псальм. Сьпеў.
2 Божа, зьлітуйся над намі і дабраславі нас; асьвяці нас абліччам Тваім, (Сэлях)
3 каб на зямлі мы пазналі шлях Твой, між усімі народамі — збаўленьне Тваё.
4 Тады будуць славіць народы Цябе, Божа, будуць славіць Цябе ўсе народы.
5 Будуць весяліцца і радавацца ўсе народы, бо Ты будзеш судзіць народы справядліва і будзеш весьці народы на зямлі. (Сэлях)
6 Тады будуць славіць народы Цябе, Божа, будуць славіць Цябе ўсе народы.
7 Зямля дасьць ураджай свой; няхай дабраславіць нас Бог, Бог наш!
8 Няхай дабраславіць нас Бог, і няхай баяцца Яго ўсе канцы зямлі!

Пс 68

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда. Сьпеў.
2 Няхай паўстане Бог, і будуць расьцярушаныя ворагі Ягоныя, і ўцякуць перад абліччам Ягоным тыя, хто ненавідзіць Яго.
3 Як разносіцца [ветрам] дым, так Ты разьвееш іх; як топіцца воск перад абліччам агню, так бязбожнікі загінуць перад абліччам Божым.
4 А праведнікі ўзрадуюцца, будуць весяліцца перад абліччам Божым і гукаць ад радасьці.
5 Сьпявайце Богу, выслаўляйце імя Ягонае! Узьвялічвайце Таго, Які ўзносіцца па-над пустыняй, ГОСПАД — імя Яго, і радуйцеся перад абліччам Ягоным.
6 Ён — Бацька сіротаў і Заступнік удоваў, Бог у сядзібе сьвятасьці Сваёй,
7 Бог, Які пасяляе самотных у дамы, Які выводзіць вязьняў з путаў, але бунтаўнікоў пакідае ў [пустыні] сьпякотнай.
8 Божа, калі Ты выходзіў перад народам Тваім, калі праходзіў праз пустыню, (Сэлях)
9 зямля дрыжала, і нябёсы тапіліся перад абліччам Бога, і гэты Сыён [дрыжаў] перад абліччам Бога, Бога Ізраіля.
10 Шчодры дождж Ты выліў, Божа, на спадчыну Тваю, і тое, што зьнемаглося, Ты ўмацаваў.
11 Жывыя Твае пасяліліся ў тым, што Ты ў добрасьці Тваёй уладкаваў для ўбогага, Божа.
12 Госпад даў вестку, і тых, якія дабравесьцяць яе, — вялікае войска.
13 Валадары з войскамі ўцякаюць, уцякаюць, а тая, што даглядае дом, дзеліць здабычу!
14 Хоць вы ляжыце паміж абораў, вы сталіся, быццам галубка, у якой крылы пакрытыя срэбрам, а пер'е — золатам зелянявым.
15 Калі Усемагутны расьцярушыў валадароў у ёй, [яна сталася], як сьнег на Сальмоне.
16 Гара Божая, гара Башан! Гара шматверхая, гара Башан.
17 Чаму глядзіце з зайздрасьцю, горы шматверхія, на гару, на якой Бог пасяліцца пажадаў? І ГОСПАД будзе жыць там заўсёды.
18 Калясьніцаў Божых дзясяткі тысячаў, тысячы тысячаў; Госпад сярод іх, [як] на Сынаі, у сьвятасьці.
19 Ты ўзыйшоў на высачыню, паланіў палон, узяў дары для людзей; і нават бунтаўнікоў, каб жылі пры [Табе], ГОСПАДЗЕ Божа.
20 Дабраслаўлёны Госпад! З дня на дзень Ён нас абдароўвае, Бог збаўленьня нашага. (Сэлях)
21 Бог для нас — Бог ратунку, і ГОСПАД — Госпад над крыніцаю сьмерці.
22 Сапраўды, Бог скрышыць галаву ворагаў Сваіх, валасатае цемя тых, што ходзяць у правінах сваіх.
23 Сказаў Госпад: «З Башану вярну, вярну з глыбіняў марскіх,
24 каб змачыў нагу тваю ў крыві, а сабакі твае — языкі ў крыві ворагаў».
25 Бачылі шэсьце Тваё, Божа, шэсьце Бога майго і Валадара майго ў сьвятыні:
26 сьпевакі наперадзе ішлі, пасьля — музыкі, пасярэдзіне — дзяўчыны з бубнамі.
27 У зграмаджэньні дабраслаўляйце Бога, ГОСПАДА, [вы, што] з крыніцы Ізраіля!
28 Там Бэн'ямін, наймалодшы, мае ўладу над імі; князі Юды з палкамі сваімі; князі Завулёна, князі Нэфталі.

29 Загадаў Бог твой моцы тваёй! Умацуй, Божа, тое, што для нас учыніў!
30 Дзеля сьвятыні Тваёй у Ерусаліме валадары будуць прыносіць дары.
31 Утаймуй зьвера ў чароце, статак быкоў сярод цялятаў народаў, якія падаюць [ніцма перад] кавалкамі срэбра; расьцяруш народы, якія жадаюць вайны!
32 Прыйдуць магнаты з Эгіпту, Куш працягне рукі свае да Бога.
33 Валадарствы зямлі, сьпявайце Богу, выслаўляйце Госпада, (Сэлях)
34 Які сядзіць на нябёсах, нябёсах адвечных. Вось, Ён дае голас Свой, голас моцы Сваёй!
35 Прызнайце моц Божую! Над Ізраілем слава Ягоная, і моц Ягоная — у аблоках.
36 Страшны Ты, Божа, у сьвятыні Тваёй, Бог Ізраіля. Ён дае сілу і магутнасьць народу [Свайму]. Дабраслаўлёны Бог!

Пс 69

1 Кіраўніку хору: на лад “Лілеі”. Давіда.
2 Збаў мяне, Божа, бо воды да душы маёй даходзяць!
3 Я заграз у глыбокім балоце бяздонным; я патрапіў у глыбіню водную, і цячэньне мяне падхапіла.
4 Я зьнямогся ад крыку майго, засохла горла маё; змарыліся вочы мае, пакуль я спадзяваўся на Бога майго.
5 Больш, чым валасоў на галаве маёй, тых, што мяне ненавідзяць без прычыны, узмацніліся тыя, што нішчаць мяне, ворагі мае падступныя. Чаго не рабаваў, мушу аддаваць.
6 Божа, Ты ведаеш дурасьць маю, і правіны мае ад Цябе не схаваныя.
7 Ня дай праз мяне асароміцца тым, што на Цябе спадзяюцца, Госпадзе, ГОСПАД Магуцьцяў; ня дай праз мяне асароміцца тым, што шукаюць Цябе, Божа Ізраіля!
8 Бо дзеля Цябе я ганьбу зношу, і сорамам пакрыта аблічча маё.
9 Я стаўся чужым для братоў маіх і чужынцам для сыноў маці маёй.
10 Бо руплівасьць пра Дом Твой зьядае мяне, і зьнявагі тых, што Цябе зьневажаюць, зыйшлі на мяне.
11 І плакала ў посьце душа мая, і сталася гэта зьнявагай мне.
12 І зрабіў я зрэбніцу вопраткай маёй, і стаўся для іх прыповесьцю.
13 Абмаўляюць мяне тыя, што сядзяць у браме [гораду], і прыпеўкі пяюць тыя, што п’юць сікеру.
14 А я да Цябе малюся, ГОСПАДЗЕ, у час упадабаньня Твайго, Божа; у вялікай міласэрнасьці Тваёй пачуй Ты мяне, у праўдзе збаўленьня Твайго!
15 Выратуй мяне з балота, каб я не заграз; ратуй ад тых, што ненавідзяць мяне, і з глыбіняў водных!
16 Няхай не падхопіць мяне цячэньне водаў, няхай не праглыне мяне глыбіня, і няхай не сашчэміць нада мною калодзеж вуснаў сваіх.
17 Пачуй мяне, ГОСПАДЗЕ, бо добрая міласэрнасьць Твая! Паводле вялікай літасьці Тваёй павярніся да мяне.
18 І не хавай аблічча Твайго перад слугою Тваім, бо я прыгнечаны; хутчэй адкажы мне!
19 Наблізься да душы маёй, барані яе; насупраць ворагам маім выбаў Ты мяне!
20 Ты ведаеш ганьбу маю, і сорам мой, і зьнявагу маю; перад Табою ўсе, што перасьледуюць мяне.
21 Ганьба разьбіла сэрца маё, і я ў роспачы; я спадзяваўся на спачуваньне, і ня маю яго, і на пацяшальнікаў, і не знайшоў іх.
22 Яны далі мне замест стравы жоўць, і, калі я смагнуў, напаілі мяне воцатам.
23 Няхай станецца стол іхні перад абліччам іхнім пасткаю, і бясьпечнасьць — сілом.
24 Няхай зацемрацца вочы іхнія, каб ня бачылі, няхай сьцёгны іхнія заўсёды дрыжаць!
25 Вылі на іх ярасьць Тваю, і жар гневу Твайго няхай дагоніць іх!
26 Няхай апусьцее сяліба іхняя, у намётах іхніх няхай ніхто не жыве!
27 Бо таго, каго Ты б’еш, яны перасьледуюць, і пра боль таго, каго Ты параніў, яны абвяшчаюць.
28 Дадай беззаконьне да беззаконьня іхняга і ня дай ім прыйсьці да праведнасьці Тваёй.

29 Няхай будуць выкрэсьленыя з кнігі жывых і ня будуць запісаныя разам з праведнікамі.
30 А я прыгнечаны і поўны тугі; збаўленьне Тваё, Божа, няхай падыме мяне!
31 Я буду хваліць імя Божае сьпевам і ўзьвялічваць Яго з падзякаю.
32 І будзе гэта больш даспадобы ГОСПАДУ, чым вол, бык з рагамі і капытамі.
33 Угледзяць [гэта] ўцісканыя і ўзрадуюцца; і ў вас, што Бога шукаеце, няхай ажыве сэрца вашае!
34 Бо ГОСПАД выслухоўвае бедных і вязьнямі Сваімі не пагарджае.
35 Няхай хваляць Яго неба і зямля, і мора, і ўсё, што рухаецца ў іх.
36 Бо збавіць Бог Сыён, і адбудуе гарады Юды, і яны паселяцца там, і возьмуць у спадчыну іх.
37 І насеньне слугаў Ягоных у спадчыну іх атрымае, і той, хто любіць імя Ягонае, жыць будзе ў іх.

Пс 70

1 Кіраўніку хору. Давіда. Напамін.
2 Божа, ратуй мяне! ГОСПАДЗЕ, пасьпяшайся на ўспамогу мне!
3 Няхай асаромяцца і зганьбяцца тыя, што шукаюць душы маёй! Няхай адступяцца і будуць у сораме тыя, якім даспадобы гора маё!
4 Няхай павернуць наўцёкі ў сораме сваім тыя, якія кажуць [мне]: «Ага! Ага!»
5 Няхай радуюцца і весяляцца ў Табе ўсе, хто шукае Цябе. Няхай кажуць заўсёды тыя, што любяць выратаваньне Тваё: «Будзь узьвялічаны, Божа!»
6 А я бедны і прыгнечаны, дык пасьпяшайся да мяне, Божа! Ты — успамога мая і ратунак мой. ГОСПАДЗЕ, не затрымлівайся!

Пс 71

1 У Табе, ГОСПАДЗЕ, я маю надзею. Ня дай мне асароміцца на вякі!
2 Паводле праведнасьці Тваёй выратуй мяне і вызвалі! Прыхілі да мяне вуха Тваё і збаў мяне!
3 Будзь мне скалой, дзе сяліба мая, куды прыходжу заўсёды, дзе Ты даў загад, каб збавіць мяне, бо Ты — скала мая і замчышча маё.
4 Божа мой, вызваль мяне з рукі бязбожніка, з рукі беззаконьніка і прыгнятальніка.
5 Бо Ты — надзея мая, Госпадзе, ГОСПАДЗЕ, пэўнасьць мая з маладосьці маёй!
6 На Цябе я абапіраўся ад чэрава [маці]; з нутра маці маёй Ты вывеў мяне; дык Табе заўсёды хвала мая!
7 Быццам дзіва стаўся я для многіх, але Ты — прыстанішча маё моцнае.
8 Няхай будуць напоўненыя вусны мае хвалой Табе, кожны дзень — услаўленьнем Цябе.
9 Не адкінь мяне ў час старасьці маёй. Калі зьнікнуць сілы мае, Ты не пакінь мяне!
10 Бо змаўляюцца ворагі мае супраць мяне, і тыя, што сочаць за душою маёй, радзяцца між сабою,
11 кажучы: «Бог пакінуў яго; дык ганіцеся за ім і схапіце яго, бо няма ў яго ратунку!»
12 Божа, не аддаляйся ад мяне! Божа мой, пасьпяшайся на ўспамогу мне!
13 Няхай будуць асаромленыя і зьнішчаныя тыя, што супрацьстаяць душы маёй! Няхай ганьбай і сорамам пакрыюцца тыя, што шукаюць ліхога для мяне!
14 А я заўсёды буду спадзявацца і множыць усю хвалу Тваю.
15 Вусны мае будуць абвяшчаць праведнасьць Тваю, і цэлы дзень — выратаваньне Тваё, бо ім лічбы ня ведаю я!
16 Перайду да магутнасьці Госпада, ГОСПАДА, буду ўзгадваць праведнасьць Тваю, толькі Тваю!
17 Божа, Ты вучыў мяне з маладосьці маёй, і дагэтуль я пра цуды Твае апавядаю.
18 І да старасьці, і да сівізны не пакідай мяне, Божа, пакуль я пра рамяно Тваё не распавяду пакаленьню гэтаму і пра магутнасьць Тваю — усім, што народзяцца яшчэ.
19 Бо праведнасьць Твая, Божа, аж да вышыняў, Ты чыніш вялікія рэчы. Божа, хто падобны да Цябе?

20 Ты даў нам угледзець шмат трывог і ліха, але Ты вернеш нас да жыцьця і з бяздоньняў зямлі
зноў узьнімеш нас.
21 Ты памножыш велічнасьць маю і зноў пацешыш мяне.
22 Дык я буду славіць на музычных інструмэнтах Цябе, мой Божа, і праўду Тваю! Буду
выслаўляць Цябе на гусьлях, Сьвяты Ізраіля!
23 Узрадуюцца вусны мае, бо я Цябе выслаўляю, і душа мая, што Ты выбавіў яе.
24 І язык мой будзе цэлы дзень разважаць пра праведнасьць Тваю, бо асаромленыя і ў ганьбе
тыя, што шукалі ліха для мяне.

Пс 72

1 Для Салямона. Божа, дай суд Твой валадару, і праведнасьць Тваю — сыну валадара.
2 Няхай судзіць ён народ Твой у праведнасьці, і ўбогіх Тваіх — у правасудзьдзі.
3 Няхай прынясуць горы супакой народу, і ўзгоркі — праведнасьць.
4 Няхай ён судзіць убогіх з народу, выбаўляе сыноў беднякоў і скрышыць прыгнятальнікаў.
5 Няхай баяцца Цябе пакуль будзе сонца і перад абліччам месяца з пакаленьня ў пакаленьне.
6 Няхай ён зыходзіць, як дождж на атаву, як кроплі дажджу, што зямля ад іх вільгатнее.
7 Няхай закрасуе праведнік у дні ягоныя, і будзе мноства супакою, аж пакуль месяц стаіць.
8 І няхай ён мае ўладу ад мора да мора і ад ракі аж да краю зямлі.
9 Перад абліччам ягоным упадуць жыхары пустыні, і ворагі ягоныя будуць лізаць пыл.
10 Валадары Таршышу і астравоў дары яму панясуць; валадары Шэвы і Сэвы прынясуць яму
даніну.
11 І паклоняцца яму ўсе валадары, усе народы будуць служыць яму.
12 Бо ён ратуе беднага, калі той галосіць, і прыгнечанага, і таго, у каго няма дапамогі.
13 Ён літуецца над гаротным і бедным і выбаўляе душы бедакоў.
14 Ад ашуканства і гвалту вызваляе душы іхнія, і ў вачах ягоных кроў іхняя вельмі каштоўная.
15 І будзе ён жыць, і даваць яму будуць золата Шэвы, і будуць маліцца за яго заўсёды, і будуць
дабраслаўляць яго ўсе дні.
16 І будзе дастатак збожжа на зямлі, на вяршынях гор; будуць шумець, як Лібан, каласы
ягоныя, і мяшчане заквітнеюць, як трава на зямлі.
17 І будзе імя ягонае на вякі, перад абліччам сонца будзе трываць імя ягонае, і будуць
дабраслаўлёныя ў ім усе народы, і будуць шчасьлівыя ў ім.
18 Дабраслаўлёны ГОСПАД Бог, Бог Ізраіля, Які Сам робіць цуды.
19 І дабраслаўлёнае імя славы Ягонай на вякі, і няхай напоўніцца славай Ягонай уся зямля!
Амэн, амэн!
20 Канец малітвы Давіда, сына Есэя.

Пс 73

1 Псальм Асафа. Які добры Бог для Ізраіля, для тых, якія чыстыя сэрцам!
2 А ў мяне амаль не спатыкнуліся ногі мае, ледзь не пакаўзнуліся крокі мае.
3 Бо я пазайздросьціў тым, што хваляць сябе, убачыўшы супакой бязбожнікаў,
4 бо яны ня маюць гора аж да сьмерці і добра ўскормлена цела іхняе,
5 нядолі людзкой яны ня маюць, і [кары], як у іншых лю-дзей, няма для іх.
6 Дзеля гэтага атачае шыю іхнюю пыха, ліхадзейства нібы шатамі атуляе іх.
7 Ад тлустасьці павылазілі вочы іхнія, прыходзіць [ім] больш за ўяўленьні сэрца [іхняга].
8 Яны зьдзекуюцца і гавораць зласьліва; звысака гавораць пра крыўду.
9 Да неба ўзьнімаюцца вуснамі сваімі, а язык іхні па зямлі гуляе.
10 Дык туды і народ Ягоны паварочваецца, і шчодрыя воды выліваюцца на іх.
11 І яны кажуць: «Як Бог даведацца? І ці мае веданьне [пра гэта] Найвышэйшы?»
12 Вось, гэткія ёсьць бязбожнікі, і ў спакоі вечным зьбіраюць яны багацьці.
13 Дык ці-ж зусім надарма я захоўваў у чыстасьці сэрца маё і абмываў у нявіннасьці рукі мае,
14 і білі мяне ўвесь дзень, і каралі мяне кожную раніцу?

15 Калі б я сказаў: «Буду думаць, як яны!» — я б гэтым адрокся ад пакаленьня сыноў Тваіх.
16 І я разважаў, каб зразумець [усё] гэта, і нядоляй гэта [здавалася] ў вачах маіх,
17 аж пакуль не ўвайшоў я ў сьвятыню Божую, і тады зразумеў канец іхні.
18 Сапраўды, на коўзкім груньце Ты ставіш іх і пасылаеш на пагібель!
19 Як жа імгненна яны спустошаныя, загінулі, счэзьлі ад жаху!
20 Як сном пасьля абуджэньня, Ты, Госпадзе, збудзіўшыся, грэбуеш вобразам іхнім.
21 Бо згоркла сэрца маё і курчыліся ныркі мае,
22 я стаўся дурнем і ня ведаў нічога, і быў перад Табой, як жывёла,
23 але я быў пры Табе заўсёды! Ты трымаеш мяне за правую руку маю,
24 Ты вядзеш мяне паводле рады Тваёй, і потым возьмеш мяне ў славу [Тваю].
25 Каго ж я маю ў небе? І на зямлі апроч Цябе мне [ніхто] не даспадобы.
26 Зьнікаюць цела маё і сэрца маё, але Бог — скала сэрца майго і частка мая на вякі.
27 Бо, вось, гінуць тыя, што ад Цябе адыходзяць; Ты вынішчаеш кожнага, хто чужаложыць, [выракаючыся] Цябе.
28 А для мяне блізкасьць Бога ёсьць дабро; я зрабіў у Госпадзе маім, ГОСПАДЗЕ, прыстанішча маё, каб абвяшчаць усе справы Твае.

Пс 74

1 Навучаньне Асафа. Чаму Ты, Божа, нас назаўсёды адкінуў? Чаму ўзгарэўся гнеў Твой на авечак чарады Тваёй?
2 Узгадай пра грамаду Тваю, якую Ты здаўна набыў, якую бароніш, як кій спадчыны Сваёй, гару Сыён, на якой Ты жывеш!
3 Зьвярні стопы Твае да таго, што загінула назаўсёды, усё панішчыў вораг у сьвятыні.
4 Рыкаюць ненавісьнікі Твае пасярод [намёту] спатканьня Твайго; паставілі на знак [гэтага] знакі свае.
5 Яны падобны да тых, што падымаюць у гушчары лясным сякеру,
6 і цяпер усе рэзьбленыя рэчы ў [сьвятыні] бярдышамі і молатамі крышаць.
7 Яны пусьцілі з агнём сьвятыню Тваю, [кінуўшы] на зямлю, апаганілі сялібу імя Твайго.
8 Сказалі ў сэрцы сваім: «Усё зруйнуем дазваньня!»; папалілі ўсе [месцы] спатканьня з Богам на зямлі.
9 Знакаў нашых ня бачым мы болей; няма больш прарока, і нікога няма, хто б ведаў, як доўга гэта будзе.
10 Як доўга, Божа, будзе зьневажаць прыгнятальнік? Ці заўсёды вораг будзе пагарджаць імем Тваім?
11 Чаму Ты стрымліваеш руку Тваю і правіцу Тваю? Вым яе з-за пазухі Тваёй і ўдар!
12 Бог ёсьць Валадар мой заўсёды, Які збаўленьне дае на зямлі.
13 Ты моцай Тваёй разьдзяліў мора, скрышыў галовы цмокаў у водах.
14 Ты раструшчыў галаву левіятану, аддаў яго на ежу народу, што жыве ў пустыні.
15 Ты расьсек крыніцу і ручай, Ты высушыў рэкі магутныя.
16 Твой ёсьць дзень, і Твая ёсьць ноч; Ты ўмацаваў сьвятло і сонца.
17 Ты назначыў усе межы зямлі; лета і зіму — Ты іх уфармаваў.
18 Памятай пра гэта: вораг зьневажае ГОСПАДА, і народ бязглузды пагарджае імем Тваім!
19 Не аддавай хеўры [гэтай] душу туркаўкі Тваёй; не забудзь назаўсёды грамаду прыгнечаных Тваіх.
20 Узглянь на запавет Твой, бо цёмныя месцы зямлі напоўненыя сялібамі гвалту.
21 Няхай не вяртаецца ўцісьнёны асаромленым, няхай бедныя і прыгнечаныя хваляць імя Тваё!
22 Паўстань, Божа! Змагайся ў справе Тваёй! Узгадай, што бязглузды ганьбіць Цябе кожны дзень.
23 Не забудзь голас ненавісьнікаў Тваіх, гармідар тых, якія паўстаюць супраць Цябе, што ўсьцяж узьнімаецца!

Пс 75

1 Кіраўніку хору: на лад: “Не загубляй!”. Псальм Асафа. Сьпеў.
2 Славім мы Цябе, Божа, славім, і тыя, што блізкія да імя Твайго, абвяшчаюць цуды Твае.
3 «Калі Я прызначу [месца] спатканьня, Я буду судзіць паводле справядлівасьці.
4 Калі растапляецца зямля і ўсе, хто жыве на ёй, Я ўзважваю слупы яе. (Сэлях)
5 Я кажу да тых, якія хваляцца сабою: “Не хваліцеся!”, і да бязбожных: “Не падымайце рогі!
6 Не падымайце высока рогі свае, не прамаўляйце, дзёрзка [трымаючы] шыю!”»
7 Бо ані з усходу, ані з захаду, ані з пустыні вывышэньне,
8 але Бог ёсьць Судзьдзя, гэтага Ён паніжае, а таго вывышае.
9 Бо ў руцэ ГОСПАДА келіх з віном, якое пеніцца; ён поўны напою зьмяшанага, і Ён з яго налівае, але толькі фуз ягоны будуць піць усе бязбожнікі на зямлі.
10 А я буду апавядаць [пра гэта] вечна, буду выслаўляць Бога Якуба.
11 І ўсе рогі бязбожнікам я адсяку, і будуць узьнятыя рогі праведнага.

Пс 76

1 Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах. Псальм Асафа. Сьпеў.
2 Вядомы ў Юдэі Бог, вялікае ў Ізраілі імя Ягонае.
3 І паўстаў у Салеме схоў Ягоны, і жытло Ягонае — на Сыёне.
4 Там Ён скрышыў стрэлы луку, шчыт і меч, і вайну. (Сэлях)
5 Ты зьзяеш, Ты слаўнейшы за горы здабычы.
6 Зрабаваныя моцныя сэрцам, дрэмлюць сном сваім, і не знайшлі ўсе мужы дужыя рук сваіх.
7 Ад пагрозаў Тваіх, Божа Якуба, здрантвелі і калясьніца, і конь.
8 Ты, [толькі] Ты [напаўняеш] страхам, і хто можа ўстаяць перад абліччам Тваім у час гневу Твайго?
9 З неба Ты даеш пачуць прысуд, зямля ў страху і маўчаньні,
10 калі Бог падняўся на суд, каб збавіць усіх уцісканых на зямлі. (Сэлях)
11 Бо [нават] ярасьць чалавека будзе славіць Цябе, парэшткамі ярасьці Ты падпярэжашся.
12 Давайце і спаўняйце абяцаньні ГОСПАДУ, Богу вашаму; усе, што навакол Яго, нясіце дары Страшліваму.
13 Ён пазбаўляе духу князёў, Ён страшны для валадароў зямных.

Пс 77

1 Кіраўніку хору. Едутуну. Псальм Асафа.
2 Голас мой да Бога, і буду крычаць; голас мой да Бога, і Ён пачуў мяне.
3 У дзень трывогі маёй шукаю я Госпада; уначы рука мая працягнутая і не зьнемагаецца; адмаўляецца ад пацяшэньня душа мая.
4 Узгадваю пра Бога і стогну; енчу і зьнемагае дух мой. (Сэлях)
5 Ты затрымаў павекі вачэй маіх; я ўстрывожаны, і не магу гаварыць.
6 Разважаю пра дні старадаўнія, пра гады спрадвечныя.
7 Уначы ўзгадваю песьні мае, енчу ў сэрцы маім, і дапытваецца дух мой:
8 «Няўжо Госпад на вякі адкінуў мяне і ня будзе больш спагадаць?
9 Няўжо назаўсёды канец міласэрнасьці Ягонай, і вестка з пакаленьня ў пакаленьне счэзла?
10 Няўжо Бог забыўся пра літасьцівасьць Сваю і спыніў у гневе Сваім літасьць Сваю?» (Сэлях)
11 І я сказаў: «Гэта боль мой, што зьмянілася правіца Найвышэйшага.
12 Буду ўзгадваць дзеяньні ГОСПАДА; бо хачу ўзгадваць цуды Твае старадаўнія.
13 І буду разважаць пра ўсе справы Твае, і пра вялікія ўчынкі Твае буду апавядаць».
14 У сьвятасьці, Божа, шлях Твой. Які Бог гэтакі вялікі, як Бог?
15 Ты — Бог, Які цуды робіць. Ты даў спазнаць народам моц Тваю.
16 Ты бараніў рамяном Тваім народ Твой, сыноў Якуба і Язэпа. (Сэлях)
17 Убачылі Цябе воды, Божа, убачылі Цябе воды і задрыжэлі, і затрэсьліся бяздоньні.

18 Лінулі з хмараў воды; выдалі голас аблокі, і лёталі стрэлы Твае.
19 Голас грымотаў Тваіх у віхуры; маланкі сусьвет асьвятлялі; зямля трэслася і дрыжэла.
20 Праз мора ішоў шлях Твой, і сьцяжына Твая — праз воды вялікія, і сьлядоў Тваіх нельга пазнаць.
21 Ты вёў народ Твой, як авечкі, рукой Майсея і Аарона.

Пс 78

1 Навучаньне Асафа. Зважай, народзе мой, на закон мой, прыхіліце вушы свае да словаў вуснаў маіх!
2 Адчыню я вусны мае ў прыповесьці, буду апавядаць загадкі старадаўнія.
3 Што чулі мы і даведаліся, і што бацькі нашыя расказалі нам,
4 гэтага не схаваем ад сыноў іхніх, абвяшчаючы пакаленьню наступнаму хвалу ГОСПАДА і магутнасьць Ягоную, і цуды Ягоныя, што Ён учыніў.
5 І Ён узьняў сьведчаньне ў Якубе, і паклаў Закон у Ізраілі, пра гэта загадаў бацькам нашым, каб яны паведамілі [гэта] сынам сваім,
6 каб ведала пакаленьне наступнае, сыны, якія народзяцца, і каб яны ў свой час абвясьцілі [гэта] сынам сваім.
7 І ўскладуць на Бога надзею сваю, і не забудуцца пра дзеяньні Божыя, і прыказаньні Ягоныя будуць захоўваць,
8 і ня будуць падобныя да бацькоў сваіх, пакаленьня бунтаўнікоў і непакорных, пакаленьня, якое нетрывалае ў сэрцы сваім і дух іхні няверны Богу.
9 Сыны Эфраіма, узброеныя лукамі, павярнулі назад у дзень бітвы.
10 Яны не захавалі запавету Божага і адмовіліся хадзіць паводле Закону Ягонага.
11 І забыліся пра дзеі Ягоныя і цуды, якія Ён даў ім бачыць.
12 Перад бацькамі іхнімі ўчыніў Ён цуды ў зямлі Эгіпецкай, на полі Цаан.
13 Ён расьсек мора і перавёў іх [праз яго], і паставіў воды, як капу.
14 І вёў іх удзень воблакам, і ўсю ноч — сьвятлом вогненным.
15 Ён рашчапіў скалы ў пустыні і напаіў іх, быццам з вялікай бездані,
16 і вывеў струмяні са скалаў, і пацяклі рэкамі воды.
17 Але яны і надалей грашылі супраць Яго, бунтаваліся супраць Найвышэйшага ў сухой [зямлі].
18 Яны выпрабоўвалі Бога ў сэрцах сваіх, жадаючы спажывы для душаў сваіх.
19 І гаварылі супраць Бога, кажучы: «Хіба Бог можа прыгатаваць стол у пустыні?»
20 Вось, Ён ударыў скалу, і лінулі воды, і ручаі пацяклі. «Але ці можа Ён даць таксама хлеба і паставіць мяса для народу Свайго?»
21 І пачуў ГОСПАД, і абурыўся, і ўзгарэўся агонь на Якуба, і ўзьняўся гнеў на Ізраіля,
22 бо яны ня верылі Богу і не спадзяваліся на збаўленьне Ягонае.
23 І Ён загадаў хмарам высока, і адчыніў дзьверы неба,
24 і спаслаў дажджом ім манну, і даў ім збожжа нябеснага.
25 Хлеб дужых еў чалавек; Ён спаслаў ім ежы ўдосталь.
26 Ён рушыў вецер усходні ў небе і сілай Сваёю навёў вецер паўднёвы;
27 і спаслаў дажджом на іх мяса, быццам пыл, і птушак крылатых — як пясок каля мора.
28 І скінуў іх пасярод табару іхняга, навакол сялібаў іхніх.
29 І елі яны, і насыціліся добра, і тое, што яны жадалі, Ён даў ім.
30 Яшчэ не пазбавіліся яны жаданьня свайго, яшчэ спажыва іхняя была ў вуснах іхніх,
31 як гнеў Божы ўзьняўся на іх, і забіў тлустых іхніх, і юнакоў Ізраіля паваліў.
32 Пры ўсім гэтым яны далей грашылі і ня верылі ў цуды Ягоныя.
33 І сканчваліся ў марнасьці дні іхнія, і гады іхнія — у страху.
34 Калі Ён забіваў іх, яны шукалі Яго, і вярталіся, і імкнуліся да Бога,
35 і ўзгадвалі, што Бог — скала іхняя, і Бог Найвышэйшы — Абаронца іхні.
36 І яны лісьлівілі Яму вуснамі Сваімі, і языком сваім хлусілі перад Ім,

37 і сэрца іхняе не было трывалым у Ім, і не былі яны верныя запавету Ягонаму.
38 А Ён, спагадлівы [да іх], дараваў ім беззаконьне іхняе і ня зьнішчыў іх, і неаднакроць спыняў
гнеў Свой, і не абуджаў усю ярасьць Сваю,
39 бо памятаў, што яны — цела, вецер, які адыходзіць і ня вернецца.
40 Як часта яны бунтаваліся супраць Яго ў пустыні, засмучалі Яго ў [зямлі] бязьлюднай!
41 І зьвярталіся, і выпрабоўвалі Бога, і абражалі Сьвятога Ізраіля.
42 Ня памяталі яны рукі Ягонай, дня, калі Ён іх вызваліў ад прыгнёту,
43 калі знакі Свае рабіў у Эгіпце, і цуды Свае на полі Цаан.
44 І Ён перамяніў рэкі іхнія і ручаіны іхнія ў кроў, што не маглі піць,
45 спаслаў на іх мухаў, што іх кусалі, і жабаў, што іх губілі.
46 І аддаў вусеням ураджаі іхнія, а працу іхнюю — саранчы.
47 Пабіў градам вінаградныя лозы іхнія, фігавыя дрэвы іхнія — шэраньню.
48 І аддаў граду скаціну іхнюю, а статкі іхнія — маланкам.
49 І спаслаў на іх жар гневу Свайго, абурэньне, і ярасьць, і трывогі, навалу злых анёлаў.
50 Выпрастаў сьцежку гневу Свайму, не захоўваў ад сьмерці душы іхнія, і жыцьцё іхняе
пошасьці аддаў.
51 І забіў усіх першародных у Эгіпце, пачаткі сілы ў намётах Хама.
52 І вывеў, як авечак, народ Свой, і вёў іх, як статак, праз пустыню.
53 І вёў іх у бясьпецы, і яны не палохаліся, а ворагаў іхніх мора накрыла.
54 І прыйшлі яны да межаў сьвятасьці Ягонай, да гары, што набыла правіца Ягоная;
55 і Ён выгнаў перад абліччам іхнім народы, і кінуў шнур, [каб падзяліць] спадчыну іхнюю, і
пасяліў у намётах іхніх калены Ізраіля.
56 Але яны выпрабоўвалі Бога Найвышэйшага і бунтаваліся супраць Яго, і сьведчаньняў Ягоных
не захоўвалі,
57 і яны адступаліся і здраджвалі, як і бацькі іхнія, вывaрочваліся, быццам той лук здрадлівы.
58 І яны злавалі Яго ўзгоркамі сваімі, і балванамі сваімі раздражнялі Яго.
59 Пачуў [гэта] Бог і абурыўся, і вельмі пагрэбаваў Ізраілем.
60 І Ён пакінуў сялібу ў Шыло, намёт, у якім жыў сярод людзей;
61 і аддаў у палон моц Сваю, і славу Сваю — у рукі прыгнятальніка.
62 І аддаў пад меч народ Свой, і на спадчыну Сваю абурыўся.
63 Юнакоў ягоных агонь зьядаў, і дзяўчаты ягоныя не былі ўшанаваныя.
64 Сьвятары ягоныя падалі ад мяча, і ўдовы ягоныя ня плакалі.
65 І быццам зо сну прачнуўся Госпад, як той волат, якога віно разьвесяліла,
66 і Ён выбіў прыгнятальнікаў дашчэнту, на вечную ганьбу аддаў іх.
67 І Ён адкінуў намёт Язэпа, і ня выбраў калена Эфраіма,
68 а выбраў калена Юды, гару Сыён, якую палюбіў.
69 І пабудаваў Ён як [пад неба] высокую сьвятыню Сваю; і як зямлю заснаваў яе на вякі.
70 І выбраў Давіда, слугу Свайго, і ўзяў яго ад абораў авечых.
71 Ад котных авечак забраў яго, каб пасьвіў Якуба, народ Ягоны, і Ізраіля, спадчыну Ягоную.
72 І ён пасьвіў іх у беззаганнасьці сэрца свайго, і ў разважлівасьці рук сваіх вадзіў іх.

Пс 79

1 Псальм Асафа. Божа, пагане ўвайшлі ў спадчыну Тваю, апаганілі сьвятыню Тваю сьвятую,
Ерусалім ператварылі ў купу друзу.
2 Трупы слугаў Тваіх аддалі на ежу птушкам нябесным, целы багабойных Тваіх — зьвярам
зямным.
3 Вылілі кроў іхнюю, як ваду, вакол Ерусаліму, і не было каму іх хаваць.
4 Мы сталіся на ганьбаваньне для суседзяў нашых, на кпіны і насьмешкі для тых, што навокал
нас.
5 Як доўга, ГОСПАДЗЕ? Ці будзеш гневацца заўсёды? Ці як агонь будзе палаць рэўнасьць Твая?

6 Вылі ярасьць Тваю на народы, якія ня ведаюць Цябе, і на валадарствы, якія імя Твайго ня
клічуць,
7 бо зжэрлі Якуба і жытло ягонае спустошылі.
8 Ня ўзгадвай нам беззаконьняў ранейшых; няхай чым хутчэй сустрэне нас літасьць Твая, бо
вельмі мы зьнемагліся.
9 Дапамажы нам, Божа збаўленьня нашага, дзеля славы імя Твайго; выратуй нас і даруй грахі
нашыя дзеля імя Твайго!
10 Навошта казаць паганам: «Дзе Бог іхні?» Няхай на паганах, у нас на вачах, вядомай
станецца помста за кроў слугаў Тваіх, што праліта!
11 Няхай дойдуць перад аблічча Тваё стогны вязьняў! Паводле вялікасьці рамяна Твайго
пакінь [пры жыцьці] сыноў, сказаных на сьмерць.
12 І нашым суседзям вярні сямікротна ў грудзі іхнія зьнявагу іхнюю, якой яны, Госпадзе, Цябе
зьневажалі!
13 А мы, народ Твой і авечкі чарады Тваёй, будзем славіць Цябе вечна і з пакаленьня ў
пакаленьне будзем абвяшчаць хвалу Тваю.

Пс 80

1 Кіраўніку хору: на лад: “Лілея сьведчаньня”. Псальм Асафа.
2 Пастыру Ізраіля, прыхілі вуха! Ты, Які, як авечкі, водзіш Язэпа, Які на херувімах сядаеш,
зазьзяй!
3 Перад абліччам Эфраіма, і Бэн’яміна, і Манасы абудзі магутнасьць Тваю і прыйдзі збавіць
нас!
4 Божа, вярні нас назад. Асьвяці нас абліччам Тваім, і будзем збаўленыя!
5 ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў, дакуль Ты будзеш у гневе пры малітве народу Твайго?
6 Ты накарміў іх хлебам сьлёзаў і шчодра сьлязьмі напаіў іх.
7 Ты паставіў нас як [костку] нязгоды дзеля суседзяў нашых, і ворагі нашыя кпяць з нас.
8 Божа Магуцьцяў, вярні нас назад. Асьвяці нас абліччам Тваім, і будзем збаўленыя!
9 Ты вінаградную лазу вынес з Эгіпту, выгнаў народы і яе пасадзіў.
10 Ты расчысьціў [месца] перад абліччам яе, і ўкараніў карані ейныя, і яна напоўніла зямлю.
11 Горы пакрыліся ценем яе, і вецьце яе — як кедры Божыя.
12 Яна пусьціла галіны свае аж да мора, і парасткі свае — да ракі.
13 Чаму Ты раскідаў агароджу ейную, і кожны, хто ідзе дарогаю, абрывае яе?
14 Дзік лясны падкопвае яе, і зьвер палявы пасьвіцца ў ёй.
15 Божа Магуцьцяў, павярніся [да нас], зірні з неба, і паглядзі, і наведай вінаградную лазу
гэтую!
16 Захавай тое, што правіца Твая пасадзіла, і парасткі, якія Ты для Сябе ўмацаваў.
17 Яны спалены агнём і пасечаны, і гінуць ад гневу аблічча Твайго.
18 Няхай рука Твая будзе над мужам правіцы Тваёй, над сынам чалавечым, якога Ты ўмацаваў
для Сябе!
19 А мы не адступімся ад Цябе; ажыві нас, і мы будзем клікаць імя Тваё.
20 ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў, вярні нас назад. Асьвяці нас абліччам Тваім, і будзем
збаўленыя!

Пс 81

1 Кіраўніку хору: на лад Гітыт. Асафа.
2 Весяліцеся перад Богам моцы нашай; радасна гукайце Богу Якуба!
3 Пачніце сьпяваньне, вазьміце бубны, гусьлі мілагучныя і псалтыр.
4 Дзьміце ў трубу ў маладзік, у поўню, у дзень сьвята нашага,
5 бо гэткая пастанова ў Ізраілі, закон Бога Якубавага.
6 Ён паставіў гэта на сьведчаньне для Язэпа, калі выводзіў з зямлі Эгіпецкай, і мы пачулі мову,
якой ня ведалі:
7 «Я прыбраў цяжар з плячэй ягоных, рукі ягоныя вольныя ад кашоў.

8 У бядзе ты паклікаў Мяне, і Я выратаваў цябе; адказаў табе з-за заслоны грымотаў,
выспрабаваў цябе пры водах Мэрывы. (Сэлях)
9 Слухай, народзе Мой! Я буду сьведчыць супраць цябе, Ізраіль. Каб ты паслухаў Мяне,
10 і не было ў цябе бога чужога, і не пакланяўся ты богу чужынцаў!
11 Я — ГОСПАД, Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай! Расчыні шырока вусны твае, і Я
напоўню іх.
12 Але народ Мой не паслухаў голасу Майго, і Ізраіль ня быў паслухмяны Мне.
13 Дык Я пакінуў іх у закамянеласьці сэрца іхняга, і яны хадзілі паводле намераў сваіх.
14 О, калі б народ Мой паслухаў Мяне, калі б Ізраіль хадзіў шляхамі Маімі,
15 Я б неўзабаве ўпакорыў ворагаў іхніх, і супраць прыгнятальнікаў іхніх павярнулася б рука
Мая.
16 Тыя, што ГОСПАДА ненавідзяць, падпарадкаваліся б ім, а шчасьце іхняе трывала б на вякі.
17 І Я карміў бы іх з тлустасьці пшаніцы, мёдам са скалы насычаў бы іх».

Пс 82

1 Псальм Асафа. Бог стаіць на сходзе багоў, сярод багоў Ён судзіць:
2 «Дакуль будзеце судзіць беззаконна і ўздымаць аблічча бязбожнікаў? (Сэлях)
3 Судзіце беднага і сірату; убогага і бедака апраўдайце.
4 Ратуйце беднага і гаротнага, з рукі бязбожнікаў вызваляйце!»
5 Нічога ня ведаюць і не разумеюць, і ў цемры ходзяць; і захісталіся ўсе падваліны зямлі!
6 Я сказаў: «Вы — богі, усе вы — сыны Найвышэйшага,
7 аднак, вы памрацё, як людзі, упадзеце, як адзін з князёў».
8 Паўстань, Божа, судзі зямлю, бо Ты возьмеш у спадчыну ўсе народы.

Пс 83

1 Сьпеў. Псальм Асафа.
2 Божа! Не маўчы, і ня будзь у маўчаньні і ў супакоі, Божа!
3 Бо вось, узварухнуліся ворагі Твае, і ненавісьнікі Твае паднялі галаву.
4 Супраць народу Твайго яны кнуюць [намеры] таемныя і радзяцца супраць тых, каго Ты
ахоўваеш.
5 Яны сказалі: «Хадзіце і сатрэм іх між народамі, і імя Ізраіля ня будзе ўзгадвацца болей».
6 Бо радзіліся яны аднадумна, супраць Цябе заключылі запавет
7 намёты Эдому і Ізмаэльцы, Мааў і Агаране,
8 Геваль і Амон, і Амалек, Філістынцы і жыхары Тыру.
9 І Асур далучыўся да іх, стаўся ён рамяном для сыноў Лота. (Сэлях)
10 Зрабі ж Ты ім як Мадыяну, як Сісэры, як Явіну каля ручая Кішон,
11 якія зьнішчаныя каля Эндору, сталіся як гной на зямлі.
12 Учыні з імі, з магнатамі іхнімі як з Арэвам і Зэвам, і з усімі князямі іхнімі, як з Зэвахам і
Сальмунам,
13 якія казалі: «Возьмем сабе ў спадчыну сялібы Божыя!»
14 Божа мой! Зрабі іх як [пыл у] віхуры, як салому пад ветрам!
15 Як агонь паліць лясы і як полымя апальвае горы,
16 гэтак Ты перасьледуй іх бурай Тваёю і віхурай Тваёй напалохай!
17 Напоўні сорамам аблічча іхнія, і будуць шукаць імя Тваё, ГОСПАДЗЕ.
18 Няхай будуць асаромленыя і спалоханыя навечна, няхай будуць у сораме і загінуць,
19 і даведаюцца, што імя Тваё — ГОСПАД, і толькі Ты — Найвышэйшы над усёй зямлёю.

Пс 84

1 Кіраўніку хору: на лад Гітыт. Сыноў Караха. Псальм.
2 Як умілаваныя сялібы Твае, ГОСПАД Магуцьцяў!

3 Прагне і тужыць душа мая па панадворках ГОСПАДА; сэрца маё і цела маё весяляцца ў Богу
Жывым.
4 Нават птушка адшукала дом, ластаўка — гняздо для сябе, дзе птушанятак сваіх укладае: каля
ахвярнікаў Тваіх, ГОСПАД Магуцьцяў, Валадар мой і Бог мой!
5 Шчасьлівыя тыя, што жывуць у Доме Тваім, заўсёды яны [ўзносяць] хвалу Табе. (Сэлях)
6 Шчасьлівы чалавек, сіла якога ў Табе, і ў сэрцы якога дарога [да Цябе]!
7 Праходзячы далінаю дрэваў бальзамовых, яны адкрываюць крыніцы, і дождж раньні
пакрывае яе дабраслаўленьнем.
8 Ідуць яны ад сілы да сілы, і прыходзяць да Бога на Сыён.
9 ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў, пачуй малітву маю! Прыхілі вуха, Божа Якуба! (Сэлях)
10 Божа, шчыце наш! Зірні і паглядзі на аблічча памазанца Твайго!
11 Бо [адзін] дзень на панадворку Тваім лепшы за тысячу [іншых]; я выбіраю стаяць каля
парога ў Доме Божым, чым жыць у намётах беззаконьня.
12 Бо ГОСПАД Бог ёсьць сонца і шчыт; ГОСПАД дае ласку і славу, і не адмовіць дабра аніякага
тым, якія ў беззаганнасьці ходзяць.
13 ГОСПАД Магуцьцяў! Шчасьлівы чалавек, які на Цябе спадзяецца!

Пс 85

1 Кіраўніку хору. Сыноў Караха. Псальм.
2 Ты зьявіў ласку, ГОСПАДЗЕ, для зямлі Тваёй, Ты вярнуў палон Якуба.
3 Ты дараваў віну народу Твайго, Ты пакрыў усе грахі іхнія. (Сэлях)
4 Ты стрымаў усю лютасьць Тваю, адвярнуў жар гневу Твайго.
5 Вярні нас, Божа збаўленьня нашага, і спыні абурэньне Тваё на нас.
6 Няўжо вечна будзеш гневацца на нас і гнеў Твой працягнеш з пакаленьня ў пакаленьне?
7 Няўжо не павернешся, каб ажывіць нас, каб народ Твой узрадаваўся ў Табе?
8 Дай нам убачыць, ГОСПАДЗЕ, міласэрнасьць Тваю, і збаўленьне Тваё дай нам!
9 Паслухаю, што кажа Бог ГОСПАД, бо Ён кажа пра супакой для народу Свайго і для багабойных
Сваіх, і няхай не зьвяртаюцца яны да глупоты. (Сэлях)
10 Вось, блізка збаўленьне Ягонае для тых, што баяцца Яго, каб слава [Божая] пасялілася на
зямлі нашай.
11 Міласэрнасьць і праўда сустрэнуцца, праведнасьць і супакой пацалуюцца.
12 Праўда ўзыйдзе з зямлі, і праведнасьць з неба глядзець будзе.
13 І ГОСПАД дасьць даброцьце, і зямля наша дасьць ураджай свой.
14 Праведнасьць будзе ісьці перад абліччам Яго і будзе стаяць на шляху крокаў Ягоных.

Пс 86

1 Малітва Давіда. Прыхілі, ГОСПАДЗЕ, вуха Тваё, адкажы мне, бо я — бедны і прыгнечаны.
2 Захавай душу маю, бо я — багабойны. Збаў Ты, Божа, слугу Твайго, які на Цябе спадзяецца.
3 Зьлітуйся нада мною, Госпадзе, бо я клічу да Цябе ўвесь дзень.
4 Узрадуй душу слугі Твайго, бо да Цябе, Госпадзе, я душу маю ўзьнімаю.
5 Бо Ты, Госпадзе, — добры і літасьцівы, і вельмі міласэрны для ўсіх, што Цябе клічуць.
6 Прыхілі вуха, ГОСПАДЗЕ, на малітву маю і выслухай голас маленьня майго!
7 У дзень тугі маёй я клічу Цябе, бо Ты адкажаш мне.
8 Няма між багамі падобнага да Цябе, Госпадзе, і няма такіх чынаў, як Твае.
9 Усе народы, якія Ты стварыў, прыйдуць і паклоняцца перад абліччам Тваім, Госпадзе, і
будуць ушаноўваць імя Тваё.
10 Бо Ты — вялікі і робіш цуды, Ты — Бог, толькі Ты адзін.
11 Навучы мяне, ГОСПАДЗЕ, шляху Твайму, каб хадзіў я ў праўдзе Тваёй; зьяднай сэрца маё,
каб баялася імя Твайго.
12 Буду славіць Цябе, Госпадзе, Божа мой, усім сэрцам маім, і буду ўшаноўваць імя Тваё на
вякі.

13 Бо міласэрнасьць Твая нада мною вялікая, і Ты выратаваў душу маю з глыбіні пекла.
14 Божа, пыхлівы паўстаў супраць мяне, і грамада моцных шукае душу маю, і на Цябе не зважаюць яны.
15 Але Ты, Госпадзе, — Бог спагадлівы і літасьцівы, павольны да гневу і багаты на міласэрнасьць і праўду.
16 Павярніся да мяне і зьлітуйся нада мною; дай сілу Тваю слузе Твайму і збаў сына служкі Тваёй!
17 Учыні Ты для мяне знак добрасьці Тваёй, і ўгледзяць гэта тыя, што ненавідзяць мяне, і будуць асаромленыя, бо Ты, ГОСПАДЗЕ, мне дапамог і пацешыў мяне.

Пс 87

1 Сыноў Караха. Псальм. Сьпеў. Угрунтаваньне ягонае на гарах сьвятых.
2 Любіць ГОСПАД брамы Сыёну больш за ўсе іншыя сялібы Якуба.
3 Слаўныя [рэчы] сказаныя пра цябе, горад Божы! (Сэлях)
4 Узгадаю пра Рагаў і Бабілон перад тымі, што ведаюць мяне. Вось, Філістына і Тыр разам з Кушам [скажуць]: «Гэты нарадзіўся там».
5 А пра Сыён будуць казаць: «Той чалавек і той чалавек нарадзіўся ў ім, і Найвышэйшы ўзмацняе яго».
6 ГОСПАД палічыць, запісваючы народы: «Гэты нарадзіўся там». (Сэлях)
7 І тыя, што сьпяваюць, і тыя, што таньчаць, [скажуць]: «Усе крыніцы мае ў Табе!»

Пс 88

1 Сьпеў. Псальм сыноў Караха. Кіраўніку хору: на лад сумны, суцішаны. Навучаньне Гэмана Эзрахі.
2 ГОСПАДЗЕ, Божа збаўленьня майго! Удзень я крычу, і ўначы я перад Табою!
3 Няхай прыйдзе перад аблічча Тваё малітва мая; прыхілі вуха Тваё да галашэньня майго.
4 Бо перасычана ліхоцьцем душа мая, і жыцьцё маё дакранаецца да пекла.
5 Я залічаны да тых, што зыходзяць у магілу; я стаўся, як чалавек, які сілы ня мае.
6 Сярод памёршых, свабодны, падобны да забітых, што ляжаць у магіле, якіх Ты ўжо ня ўзгадваеш, і адсечаны яны ад рукі Тваёй.
7 Ты кінуў мяне ў яму найглыбейшую, у месца цёмнае, у глыбіню.
8 Націснула на мяне ярасьць Твая, і ўсімі хвалямі Тваімі прыціснуў Ты мяне. (Сэлях)
9 Ты аддаліў ад мяне знаёмых маіх, Ты зрабіў мяне агідным для іх; я зьвязаны і выйсьці не магу.
10 Самлела вока маё ад пакутаў; кожны дзень я клічу Цябе, ГОСПАДЗЕ, і выцягваю да Цябе рукі мае.
11 Ці Ты зробіш цуд для памёршых? Ці нябожчыкі паўстануць і будуць славіць Цябе? (Сэлях)
12 Ці будзе абвешчана ў магіле міласэрнасьць Твая, і вернасьць Твая — у [месцы] загубы?
13 Ці ў цемры даведаюцца пра цуды Твае, і пра праведнасьць Тваю — у зямлі забыцьця?
14 Але я галашу да Цябе, ГОСПАДЗЕ, і раніцаю малітва мая сустракае Цябе.
15 Дзеля чаго, ГОСПАДЗЕ, Ты пакінуў душу маю, хаваеш аблічча Тваё ад мяне?
16 З маленства я прыгнечаны і паміраю; пераносячы жахі Твае, я зьнямогся.
17 Нада мною прайшоў жар [гневу] Твайго, пагрозы Твае вынішчаюць мяне,
18 атачаюць мяне, як вада, кожны дзень, абступаюць мяне разам.
19 Ты аддаліў ад мяне тых, што любяць [мяне], і бліжніх, знаёмыя мае — у цемры.

Пс 89

1 Навучаньне Этана Эзрахі.
2 Пра міласэрнасьць ГОСПАДА буду сьпяваць вечна; з пакаленьня ў пакаленьне буду апавядаць пра вернасьць Тваю вуснамі маімі.
3 Бо я сказаў: «Навечна збудаваная міласэрнасьць, на нябёсах Ты ўгрунтаваў вернасьць Тваю».
4 «Я заключыў запавет Мой з выбранцам Маім, прысягнуў Давіду, слузе Майму:

5 “На вякі ўгрунтую насеньне тваё, збудую пасад твой з пакаленьня ў пакаленьне”». (Сэлях)
6 І нябёсы славяць цуды Твае, ГОСПАДЗЕ, і вернасьць Тваю — у царкве сьвятых.
7 Бо хто параўнаецца ў аблоках з ГОСПАДАМ? Хто падобны да ГОСПАДА сярод сыноў Божых?
8 Бог гэтак страшлівы на нарадзе сьвятых, і страшны для ўсіх, што вакол Яго.
9 ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў, хто гэтакі моцны, як Ты, ГОСПАДЗЕ? І вернасьць Твая навакол Цябе.
10 Ты пануеш над узьнёсласьцю мора, і калі хвалі ўздымаюцца, Ты іх сьцішаеш.
11 Ты скрышыў Рагава, быццам параненага; рамяном моцы Тваёй Ты раскідаў ворагаў Тваіх.
12 Тваё ёсьць неба, і Твая — зямля; сусьвет і ўсё, што ў ім, Ты заснаваў.
13 Поўнач і поўдзень — Ты іх стварыў; Табор і Гермон радуюцца дзеля імя Твайго.
14 Рамяно Тваё магутнае; рука Твая дужая, узьнятая правіца Твая.
15 Праведнасьць і суд — падставы пасаду Твайго; міласэрнасьць і праўда ідуць перад абліччам Тваім.
16 Шчасьлівы народ, які ведае трубны голас Твой. ГОСПАДЗЕ, яны ходзяць у сьвятле аблічча Твайго!
17 У іменьні Тваім будуць радавацца яны ўвесь дзень, і праведнасьцю Тваёй будуць узвышаны.
18 Бо Ты — краса сілы іхняй, і праз ласку Тваю ўзьняты рог наш.
19 Бо ад ГОСПАДА шчыт наш, і ад Сьвятога Ізраіля валадар наш.
20 Тады, гаворачы ў відзежы да багабойнага Твайго, Ты сказаў: «Я даў успамогу волату, узвысіў юнака з народу.
21 Знайшоў Я Давіда, слугу Майго, сьвятым алеем Маім памазаў яго.
22 Рука Мая ўмацуе яго, і рамяно Маё ўзмоцніць яго.
23 Не пераможа вораг яго, і сын беззаконьня не асіліць яго.
24 І Я скрышу перад абліччам ягоным тых, што прыгнятаюць яго, а тых, што ненавідзяць яго, павалю.
25 І будзе вернасьць Мая і міласэрнасьць Мая з ім, і ў імя Маё ўзьнясецца рог ягоны.
26 І Я палажу руку ягоную на мора, а правіцу ягоную — на рэкі.
27 Ён будзе клікаць Мяне: “Ты — Айцец Мой, Ты — Бог мой і скала збаўленьня майго!”
28 Я зраблю яго першародным, найвышэйшым між валадароў зямлі.
29 На вякі захоўваючы, захаваю для яго міласэрнасьць Маю, і запавет Мой з ім будзе верным.
30 І Я зраблю, што насеньне ягонае будзе трываць вечна, і пасад ягоны — як дні нябёсаў.
31 Калі сыны ягоныя пакінуць Закон Мой і ня будуць хадзіць паводле судоў Маіх,
32 калі парушаць пастановы Мае і прыказаньняў Маіх ня будуць захоўваць,
33 Я наведаю правіны іхнія з кіем, і беззаконьні іхнія — з пакараньнямі,
34 але міласэрнасьці Маёй не забяру ў яго, і вернасьці Маёй ня здраджу.
35 Не парушу Я запавету Майго і таго, што выйшла з вуснаў Маіх, не зьмяню.
36 Я пакляўся [адзін] раз у сьвятасьці Маёй, што не схлушу Давіду.
37 Насеньне ягонае будзе на вякі, і пасад ягоны — як сонца перада Мною.
38 Як месяц будзе ўмацаваны ён на вякі, а сьведка ў небе — верны». (Сэлях)
39 Але Ты пакінуў і пагрэбаваў, адвярнуўся ад памазанца Твайго!
40 Ты пагардзіў запаветам са слугою Тваім, кінуў на зямлю дыядэму ягоную.
41 Ты збурыў усе загарадкі ягоныя, прывёў загубу ў замкі ягоныя.
42 Усе, што праходзілі дарогаю, рабавалі яго; ён стаўся ганьбаю для суседзяў сваіх.
43 Ты ўзьняў правіцы тых, якія перасьледавалі яго, і ўзрадаваў усіх ворагаў ягоных.
44 Ты назад павярнуў джала мяча ягонага і ня даў перамогі ў вайне,
45 Ты прыбраў бляск ягоны і пасад ягоны паваліў на зямлю.
46 Ты скараціў дні маладосьці ягонай, ганьбай пакрыў яго. (Сэлях)
47 Як доўга, ГОСПАДЗЕ? Ці назаўсёды Ты будзеш хавацца? Ці будзе палаць, як агонь, ярасьць Твая?
48 Узгадай, які век мой, якой марнасьцю Ты стварыў усіх сыноў чалавечых!

49 Хто з людзей можа жыць і ня ўгледзіць сьмерці? Хто выбавіць душу сваю з рукі пекла?
(Сэлях)
50 Дзе, Госпадзе, даўнейшая міласэрнасьць Твая, як Ты прысягаў Давіду ў вернасьці Тваёй!
51 Узгадай, Госпадзе, ганьбу слугаў Тваіх, што ў нутры я нашу ад усіх народаў шматлікіх,
52 якою зьневажаюць ворагі Твае, ГОСПАДЗЕ, якой зьневажаюць сьляды памазанца Твайго!
53 Няхай будзе дабраслаўлёны ГОСПАД на вякі. Амэн! Амэн!

Пс 90

1 Малітва Майсея, мужа Божага. Госпадзе, Ты быў для нас сялібаю з пакаленьня ў пакаленьне!
2 Перш, чым горы нарадзіліся, і Ты даў кшталт зямлі і сусьвету, ад веку і на вякі Ты ёсьць Бог.
3 Ты вяртаеш у друз чалавека і кажаш: «Вярніцеся, сыны Адама!»
4 Бо тысяча гадоў перад вачыма Тваімі — як учорашні дзень, што мінуў, і варта начная.
5 Ты іх зносіш [разводзьдзем]; яны — як сон і як трава, якая раніцаю зелянее.
6 Раніцаю квітнее яна і зелянее, а ўвечары зрэжуць яе, і яна сохне.
7 Бо мы зьнікаем ад гневу Твайго, ад ярасьці Тваёй мы спалоханыя.
8 Ты паклаў беззаконьні нашыя перад Сабою, нашыя схаваныя [грахі] — перад сьветласьцю аблічча Твайго.
9 Бо ўсе дні нашыя прападаюць ад абурэньня Твайго, гады нашы сканчваюцца, быццам той уздых.
10 Дзён гадоў нашых — гадоў семдзясят, а як пры сіле — гадоў восемдзясят; і найлепшае ў іх — гарапашнасьць і ліхоцьце, бо прамінаюць яны шпарка, і мы адлятаем.
11 Хто ведае моц гневу Твайго і абурэньне Тваё, што як страх перад Табою?
12 Лічыць дні нашыя навучы Ты нас, каб прыдбаць нам мудрае сэрца.
13 Павярніся, ГОСПАДЗЕ! Дакуль Ты? Пашкадуй слугаў Тваіх!
14 Насыць нас раніцаю міласэрнасьцю Тваёй, каб мы весяліліся і радаваліся ў-ва ўсе дні нашыя.
15 Узрадуй Ты нас паводле дзён, у якія Ты прыгнятаў нас, і паводле гадоў, у якія мы бачылі ліхое.
16 Няхай зьявіцца над слугамі Тваімі справа Твая, і веліч Твая — над сынамі іхнімі.
17 Няхай хараство Госпада, Бога нашага, будзе над намі і ўмацуе справы рук нашых. Умацуй Ты справы рук нашых!

Пс 91

1 Той, які жыве пад заслонай Найвышэйшага і пад ценем Усемагутнага,
2 кажа да ГОСПАДА: «Ты — прыстанішча маё і цьвярдыня мая, Бог мой, на Якога я спадзяюся».
3 Бо Ён выратуе цябе ад пасткі птушкалова, ад пошасьці сьмяротнай.
4 Пер'ем Сваім закрые цябе, і пад крыламі Ягонымі будзеш мець надзею; праўда Ягоная — шчыт і заслона.
5 Не спалохаешся страху ўначы, ані стралы, якая ўдзень ляціць,
6 ані пошасьці, якая ў цемры прыходзіць, ані заразы, якая сярод белага дня пустошыць.
7 Тысяча побач з табой упадзе і дзесяць тысячаў праваруч ад цябе, а да цябе яна не падыйдзе.
8 Толькі вачыма тваімі глядзець будзеш і ўбачыш з бязбожнымі расплату.
9 За тое, што ты ГОСПАДА, прыбежышча сваё, і Найвышэйшага выбраў за сялібу сабе,
10 не спаткае цябе злое, і пакараньне не наблізіцца да намёту твайго.
11 Бо Ён анёлам Сваім загадае пра цябе, каб захоўвалі цябе на ўсіх шляхах тваіх.
12 На руках панясуць цябе, каб не спатыкнуўся аб камень нагою тваёю.
13 Па ільвах і гадзюках хадзіць будзеш, львянятаў і цмокаў патопчаш.
14 «За тое, што ён Мяне ўзьлюбіў, збаўлю яго; узвышу яго, бо імя Маё ведае.
15 Будзе клікаць Мяне, і Я адкажу яму; у бядзе Я буду з ім, выратую яго і ўшаную яго.
16 Доўгімі днямі насычу яго і дам убачыць збаўленьне Маё».

Пс 92

1 Псальм. Сьпеў на дзень суботы.
2 Добра славіць ГОСПАДА і выслаўляць імя Тваё, Найвышэйшы!
3 Апавядаць раніцаю міласэрнасьць Тваю, і вернасьць Тваю — уначы,
4 на дзесяціструнным псалтыры і на гусьлях граючы.
5 Бо Ты ўзьвесяліў мяне, ГОСПАДЗЕ, справамі Тваімі, творам рук Тваіх буду радавацца.
6 Якія вялікія ўчынкі Твае, ГОСПАДЗЕ; вельмі глыбокія думкі Твае.
7 Чалавек бязглузды ня будзе ведаць, і дурань не зразумее гэтага.
8 Калі бязбожнікі зелянеюць, як трава, і ўсе ліхадзеі квітнеюць, няхай будуць яны зьнішчаны на вякі!
9 А Ты, ГОСПАДЗЕ, узвышаны на вякі!
10 Бо вось ворагі Твае, ГОСПАДЗЕ, бо вось ворагі Твае загінуць, і будуць расьцярушаныя ўсе ліхадзеі.
11 І Ты ўзнясеш рог мой, як у аднарога, я буду памазаны сьвежым алеем.
12 Будуць глядзець вочы мае на ворагаў маіх, і пра злачынцаў, якія паўсталі супраць мяне, пачуюць вушы мае.
13 Праведнік быццам пальма зелянее, ён расьце, як той кедр на Лібане.
14 Насаджаныя ў Доме ГОСПАДА зелянеюць на панадворках Бога нашага.
15 Яны плод свой даюць і ў старасьці, яны сакавітыя і сьвежыя,
16 каб абвяшчаць, што ГОСПАД справядлівы, Скала мая, і няма ў Ім беззаконьня.

Пс 93

1 ГОСПАД валадарыць, апрануўся ў веліч, апрануўся ГОСПАД у моц і падперазаўся. Ён сусьвет умацаваў, што не захістаецца.
2 Умацаваны пасад Твой спрадвеку; і Ты — спакон вякоў!
3 Узьнімаюць рэкі, ГОСПАДЗЕ, узьнімаюць рэкі голас свой, узьнімаюць рэкі хвалі свае.
4 Слаўнейшы за голас водаў вялікіх, за хвалі марскія — слаўны на вышынях ГОСПАД.
5 Сьведчаньні Твае вельмі верныя; сьвятасьць аздабляе Дом Твой, ГОСПАДЗЕ, на вечныя дні!

Пс 94

1 Божа помсты, ГОСПАДЗЕ, Божа помсты, зазьзяй!
2 Узьніміся, Судзьдзя зямлі, аднагародзь пыхліўцам за тое, што зрабілі яны!
3 Дакуль бязбожнікі, ГОСПАДЗЕ, дакуль бязбожнікі будуць радавацца?
4 [Дакуль] будуць плявузгаць, прамаўляць дзёрзка? [Дакуль] будуць гаварыць усе злачынцы?
5 Яны крышаць народ Твой, ГОСПАДЗЕ, прыціскаюць спадчыну Тваю.
6 Удоваў і прыхадняў мардуюць і сіротаў забіваюць,
7 і кажуць: «Ня ўбачыць гэтага ГОСПАД, і не даведаецца Бог Якуба!»
8 Зразумейце, бязглуздыя з народу! І калі, бязглуздыя, паразумнееце?
9 Ці ж Той, Які вуха стварыў, не пачуе? Ці ж Той, Які вока ўфармаваў, ня ўбачыць?
10 Ці ж Той, Які навучае народы, ня будзе караць, Той, Які вучыць чалавека ведам?
11 ГОСПАД ведае думкі чалавечыя, што яны — марнасьць.
12 Шчасьлівы чалавек, якога Ты, ГОСПАДЗЕ, навучаеш і вучыш яго Закону Твайму,
13 каб быў ён у супакоі ў дні ліхія, пакуль выкапаны будзе дол для бязбожніка.
14 Бо не адкіне ГОСПАД народ Свой, і спадчыну Сваю не пакіне.
15 Бо вернецца суд да праведнасьці, і пойдуць за ім усе правыя сэрцам.
16 Хто за мяне супраць злачынцаў паўстане? Хто заступіцца за мяне супраць тых, што робяць злачынства?
17 Калі б ГОСПАД ня быў успамогай мне, хутка душа мая пасялілася б у [месцы] маўчаньня.
18 Калі я сказаў: «Хістаецца нага мая!», міласэрнасьць Твая, ГОСПАДЗЕ, умацавала мяне.
19 Калі мноства цяжкіх думак у нутры маім, пацяшэньні Твае падбадзёрваюць душу маю.

20 Ці ж можа таварышаваць з Табою пасад загубы, які чыніць ліхоцьце супраць пастановы
[Тваёй]?
21 Яны зьбіраюцца супраць душы праведніка і кроў нявінную асуджаюць.
22 Але ГОСПАД стаўся ўмацаваным замкам для мяне, і Бог мой — скалой прыстанішча майго.
23 І зьверне Ён на іх злачынства іхняе, і ў ліхоце іхняй вынішчыць іх; вынішчыць іх ГОСПАД,
Бог наш.

Пс 95

1 Хадземце, будзем радавацца ў ГОСПАДЗЕ, усклікаць Скале збаўленьня нашага!
2 Станьма перад абліччам Ягоным з падзякаю, гімны ўсклікайма Яму!
3 Бо ГОСПАД ёсьць Бог вялікі і Валадар вялікі над усімі багамі.
4 У руцэ Ягонай глыбіні зямлі, і Ягоныя вяршыні найвышэйшыя гор.
5 Ягонае мора, бо Ён яго ўчыніў, і сухазем'е рукі Ягоныя ўкшталтавалі.
6 Прыйдзіце, паклонімся і ўпадзем, укленчым перад абліччам ГОСПАДА, Творцы нашага!
7 Бо Ён — Бог наш, а мы — народ чарады Ягонай і авечкі рукі Ягонай. Сёньня, калі пачуеце голас
Ягоны:
8 «Не рабіце цьвёрдымі сэрцы вашыя, як у Мэрыве, як у дзень выпрабаваньня ў пустыні,
9 дзе бацькі вашыя выпрабоўвалі Мяне, спакушалі Мяне, хоць і бачылі справы Мае!
10 Сорак гадоў Я брыдзіўся пакаленьнем гэтым, і Я сказаў: "Яны — народ, што блукаецца
сэрцам, і яны не спазналі шляхоў Маіх".
11 Дык Я прысягнуў у гневе Маім, што яны ня ўвойдуць у супачынак Мой».

Пс 96

1 Сьпявайце ГОСПАДУ новы сьпеў, сьпявайце ГОСПАДУ, уся зямля!
2 Сьпявайце ГОСПАДУ, дабраслаўляйце імя Ягонае! З дня на дзень дабравесьціце пра
збаўленьне Ягонае!
3 Абвяшчайце між народамі славу Ягоную, між усімі людзьмі — цуды Ягоныя.
4 Бо вялікі ГОСПАД і годны [ўсялякай] хвалы, годны страху больш за ўсіх багоў!
5 Бо ўсе богі народаў — ідалы, а ГОСПАД нябёсы стварыў.
6 Годнасьць і велічнасьць перад абліччам Ягоным, моц і краса — у сьвятыні Ягонай.
7 Аддайце ГОСПАДУ, плямёны народаў, аддайце ГОСПАДУ славу і моц!
8 Аддайце ГОСПАДУ славу імя Ягонага, нясіце дары і ідзіце ў панадворкі Ягоныя.
9 Пакланіцеся ГОСПАДУ ў велічы сьвятыні; дрыжыце перад абліччам Яго, усе землі!
10 Скажыце народам: «ГОСПАД валадарыць! Ён сусьвет умацаваў, каб не пахіснуўся. І Ён будзе
судзіць народы паводле справядлівасьці».
11 Няхай узьвесяляцца нябёсы і ўзрадуецца зямля; няхай мора гудзе, і ўсё, што ў ім.
12 Няхай усьцешыцца поле і ўсё, што на ім; і будуць усклікаць тады ўсе дрэвы лясныя
13 перад абліччам ГОСПАДА, бо Ён ідзе, бо Ён ідзе судзіць зямлю. Судзіць Ён будзе сусьвет
паводле праведнасьці і народы — паводле вернасьці Сваёй.

Пс 97

1 ГОСПАД валадарыць! Няхай радуецца зямля, няхай весяліцца мноства астравоў!
2 Хмары і імгла навакол Яго; праведнасьць і суд — падставы пасаду Ягонага.
3 Агонь ідзе перад абліччам Ягоным і паліць наўкола супраціўнікаў Ягоных.
4 Маланкі Ягоныя сусьвет асьвятляюць; бачыць гэта зямля і дрыжыць.
5 Горы топяцца, быццам воск, ад аблічча ГОСПАДА, ад аблічча Госпада ўсёй зямлі.
6 Апавядаюць нябёсы праведнасьць Ягоную, і ўсе народы бачаць славу Ягоную.
7 Асаромяцца ўсе, што балванам служаць, што ідаламі сваімі хваляцца. Пакланіцеся Яму, усе
богі!
8 Чуе гэта Сыён і весяліцца, і радуюцца дочкі Юды дзеля судоў Тваіх, ГОСПАДЗЕ!
9 Бо Ты, ГОСПАДЗЕ, над усёй зямлёй Найвышэйшы, Ты ўзьнёсься па-над усімі багамі.

10 Вы, што любіце ГОСПАДА, ненавідзьце зло! Ён захоўвае душы багабойных Сваіх, з рукі
бязбожных выратоўвае іх.
11 Сьвятло ўзыходзіць для праведніка, і радасьць — для шчырых сэрцам.
12 Весяліцеся ў ГОСПАДЗЕ, праведнікі, і слаўце на ўспамін сьвятасьці Ягонай!

Пс 98

1 Псальм. Сьпявайце ГОСПАДУ новы сьпеў, бо Ён цуды ўчыніў! Правіца Ягоная і рамяно
сьвятасьці Ягонай здабылі перамогу Яму.
2 ГОСПАД зьявіў збаўленьне Сваё, перад вачыма народаў адкрыў праведнасьць Сваю.
3 Узгадаў пра міласэрнасьць Сваю і вернасьць Сваю для дому Ізраіля. Усе канцы зямлі ўбачылі
збаўленьне Бога нашага.
4 Усклікай ГОСПАДУ, уся зямля! Цешцеся, і радуйцеся, і выслаўляйце!
5 Выслаўляйце ГОСПАДА на гусьлях, на гусьлях і галосным сьпяваньнем!
6 На трубах і гукам рогу ўсклікайце перад абліччам Валадара ГОСПАДА!
7 Няхай мора гудзе і ўсё, што ў ім, сусьвет і ўсё, што жыве ў ім!
8 Няхай пляскаюць у далоні рэкі, і горы радуюцца разам [з імі]
9 перад абліччам ГОСПАДА, бо Ён ідзе судзіць зямлю. Сусьвет Ён будзе судзіць паводле
праведнасьці і народы — паводле справядлівасьці.

Пс 99

1 ГОСПАД валадарыць, няхай дрыжаць народы! Ён сеў на херувімаў, няхай узварухнецца
зямля!
2 Вялікі ГОСПАД на Сыёне, Ён узвысіўся па-над усімі народамі.
3 Няхай славяць імя Ягонае вялікае і страшнае, [бо] сьвятое яно!
4 І моц Валадара, Які любіць суд. Ты ўстанавіў справядлівасьць, Ты суд і праведнасьць учыніў
у Якубе.
5 Узьвялічвайце ГОСПАДА, Бога нашага, і пакланіцеся каля падножжа стоп Ягоных, [бо] сьвяты
Ён!
6 Майсей і Аарон сярод сьвятароў Ягоных, і Самуэль сярод тых, што клічуць імя Ягонае; яны
клікалі ГОСПАДА, і Ён адказаў ім.
7 У слупе воблачным прамаўляў Ён да іх; яны захоўвалі сьведчаньні Ягоныя і пастановы, якія
Ён даў ім.
8 ГОСПАДЗЕ, Божа наш, Ты адказваў ім. Ты быў для іх Богам, Які прабачаў іх і адплочваў за
ўчынкі.
9 Узьвялічвайце ГОСПАДА, Бога нашага, і пакланіцеся перад гарой Яго сьвятою, бо сьвяты
ГОСПАД, Бог наш!

Пс 100

1 Псальм падзякі. Усклікай ГОСПАДУ, уся зямля!
2 Служыце ГОСПАДУ з радасьцю, прыходзьце перад аблічча Ягонае з хвалою!
3 Ведайце, што ГОСПАД ёсьць Бог! Ён Сам нас зрабіў, і мы — Ягоныя, народ Ягоны і авечкі
чарады Ягонай.
4 Уваходзьце ў брамы Ягоныя з падзякай, у панадворкі Ягоныя — з праслаўленьнем! Слаўце
Яго, дабраслаўляйце імя Ягонае!
5 Бо добры ёсьць ГОСПАД, на вякі міласэрнасьць Ягоная і з пакаленьня ў пакаленьне вернасьць
Ягоная!

Пс 101

1 Псальм Давіда. Пра міласэрнасьць і суд буду сьпяваць; Цябе, ГОСПАДЗЕ, буду выслаўляць.
2 Буду разважаць пра шлях беззаганны. Калі ж Ты прыйдзеш да мяне? Буду хадзіць у
беззаганнасьці сэрца майго пасярод дому майго.

3 Не пастаўлю перад вачыма маімі рэчы нягодныя; учынкі паганыя я ненавіджу, не
прылепяцца яны да мяне.
4 Сэрца падступнае далёка ад мяне, зла не хачу я і ведаць.
5 Таго, хто ачарняючы, ачарняе таемна бліжняга свайго, я вынішчу; вочы пыхлівыя і сэрца
надзьмутае ня буду зносіць.
6 Вочы мае на верных зямлі, каб жылі пры мне. Той, хто ходзіць па шляху беззаганнасьці,
будзе служыць мне.
7 Ня будзе ў доме маім жыць той, хто здраду кнуе; той, хто гаворыць хлусьліва, ня будзе стаяць
перад вачыма маімі.
8 Раніцаю буду вынішчаць усіх бязбожнікаў зямлі, каб у горадзе ГОСПАДА зьнішчыць усіх
злачынцаў.

Пс 102

1 Малітва прыгнечанага, калі ён зьнемагае і перад ГОСПАДАМ вылівае смутак свой.
2 ГОСПАДЗЕ, пачуй малітву маю, і лямант мой няхай дойдзе да Цябе!
3 Не хавай аблічча Твайго ад мяне ў дзень уціску, прыхілі да мяне вуха Тваё ў дзень, калі клічу;
хутчэй адкажы мне.
4 Бо зьніклі, як дым, дні мае, і косткі мае выпаленыя як у гарне.
5 Скошанае як трава і высахлае сэрца маё, ажно забываюся я есьці хлеб свой.
6 Ад голасу ўздыханьня майго косткі мае прыляпіліся да цела майго.
7 Я падобны да пэлікана ў пустыні, стаўся як пугач сярод спусташэньня.
8 Я ня сплю і стаўся як птушка самотная на даху.
9 Увесь дзень зьневажаюць мяне ворагі мае; тыя, што сьмяюцца з мяне, запрысягнуліся
супраць мяне.
10 Бо я ем попел як хлеб, і напой мой са сьлязьмі мяшаю
11 праз гнеў [Твой] і абурэньне, бо Ты падняў мяне і кінуў.
12 Дні мае, быццам цені, зьнікаюць, і я сохну, быццам трава.
13 А Ты, ГОСПАДЗЕ, будзеш жыць на вякі, і памяць Твая — з пакаленьня ў пакаленьне.
14 Ты паўстанеш, зьлітуешся над Сыёнам, бо час даравацъ яму, бо прыйшла пара.
15 Бо слугі Твае маюць ласку да камянёў ягоных і літасьць — над пылам ягоным.
16 І будуць баяцца народы імя ГОСПАДА, і ўсе валадары зямныя — славы Тваёй,
17 бо адбудаваў ГОСПАД Сыён і даў убачыць Сябе ў славе Сваёй.
18 Ты прыхіліўся да малітвы прыніжанага і не пагардзіў малітвамі іхнімі.
19 Будзе запісана гэта для пакаленьня наступнага, і народ, які будзе створаны, будзе хваліць
ГОСПАДА,
20 бо Ён глянуў з вышыні сьвятасьці Сваёй, паглядзеў ГОСПАД з нябёсаў на зямлю,
21 каб пачуць стогны вязьня, каб вызваліць сыноў, сказаных на сьмерць,
22 каб апавядалі на Сыёне імя ГОСПАДА, і хвалу Ягоную — у Ерусаліме,
23 калі разам зьбяруцца народы і валадарствы, каб служыць ГОСПАДУ.
24 Змардаваў Ён у дарозе сілу маю, скараціў дні мае.
25 Я кажу: «Божа мой, не вазьмі Ты мяне ў палове дзён маіх! З пакаленьня ў пакаленьне гады
Твае!
26 Здаўна Ты заснаваў зямлю, і нябёсы — твор рук Тваіх.
27 Яны згінуць, а Ты застанешся; і ўсе яны, як адзеньне, спарахнеюць, як вопратку іх
пераменіш, і яны пераменяцца;
28 а Ты — Той самы, і гады Твае ня маюць канца!
29 Сыны слугаў Тваіх будуць жыць, і насеньне іхняе будзе ўмацаванае перад абліччам Тваім».

Пс 103

1 Псальм Давіда. Дабраславі, душа мая, ГОСПАДА, і ўсё нутро маё — імя Ягонае сьвятое!
2 Дабраславі, душа мая, ГОСПАДА і не забывайся пра ўсё, што Ён зрабіў!

3 Ён даруе табе ўсе беззаконьні твае, вылечвае ўсякую немач тваю,
4 вызваляе ад магілы жыцьцё тваё, літасьцю вялікай і міласэрнасьцю карануе цябе,
5 насычае дабром старасьць тваю, аднаўляе, як у арла, маладосьць тваю.
6 Праведнасьць чыніць ГОСПАД і суд для ўсіх прыгнечаных.
7 Ён зрабіў вядомымі шляхі Свае Майсею, сынам Ізраіля — учынкі Свае.
8 Спагадлівы і літасьцівы ГОСПАД, павольны да гневу і багаты на міласэрнасьць.
9 Не назаўсёды Ён гневам палае і ня вечна памятае ліхое.
10 Не паводле грахоў нашых нам Ён дае і не ўчыняе з намі паводле беззаконьняў нашых,
11 бо як высока неба над зямлёю, так вялікая міласэрнасьць Ягоная да тых, што баяцца Яго,
12 як далёкі ад захаду ўсход, так [далёка] Ён нашыя правіны ад нас аддаліў,
13 як літуецца бацька над сынамі, так ГОСПАД літуецца над тымі, што баяцца Яго.
14 Бо ведае Ён настаўленьне нашае, памятае, што мы — [толькі] пыл.
15 Дні чалавечыя — як трава; як кветка ў полі, так ён квітнее,
16 бо пройдзе над ім вецер, і няма яго, і ўжо месца ягонае больш не пазнае яго.
17 Але міласэрнасьць ГОСПАДА ад веку і на вякі над тымі, што баяцца Яго, і праведнасьць Ягоная — над сынамі сыноў
18 тых, якія захоўваюць запавет Ягоны і загады Ягоныя памятаюць, каб выконваць іх.
19 ГОСПАД умацаваў пасад Свой на нябёсах, і валадарства Ягонае над усім пануе.
20 Дабраславіце ГОСПАДА, анёлы Ягоныя, магутныя моцаю, што выконваеце слова Ягонае, чуючы голас слова Ягонага!
21 Дабраславіце ГОСПАДА, усе войскі Ягоныя, служыцелі Ягоныя, што выконваеце волю Ягоную!
22 Дабраславіце ГОСПАДА, усе творы Ягоныя па ўсіх месцах панаваньня Ягонага! Дабраславі, душа мая, ГОСПАДА!

Пс 104

1 Дабраславі, душа мая, ГОСПАДА! ГОСПАДЗЕ, Божа мой, Ты вельмі вялікі! У годнасьць і велічнасьць Ты апрануўся!
2 Ты ахінуўся ў сьвятло, быццам у шату, Ты раскінуў нябёсы, як намёт.
3 Ты паставіў над водамі хорамы Твае, Ты паставіў хмары як калясьніцу Тваю, Ты ходзіш на крылах ветру.
4 Ты робіш вятры анёламі Тваімі, служыцелямі Тваімі — агонь, што палае.
5 Ты паставіў зямлю на месцы яе, ня можа яна пахіснуцца на вякі вечныя.
6 Бяздоньнямі, як вопраткай, закрыў Ты яе; па-над горамі воды стаялі.
7 Перад пагрозай Тваёй яны ўцякалі, перад голасам грымотаў Тваіх адступаліся.
8 Узьнімаліся горы, зыходзілі раўніны на месцы, якія Ты заснаваў для іх.
9 Ты паклаў [водам] мяжу, якую не пяройдуць; ня вернуцца, каб закрыць зямлю.
10 Ты пасылаеш крыніцы для ручаёў, яны цякуць паміж гораў,
11 пояць усіх зьвяроў палявых, праганяюць дзікія аслы смагу сваю.
12 Над імі жывуць птушкі нябесныя, праз вецьце голас падаюць.
13 Ты поіш горы з хорамаў Тваіх; пладамі дзеяў Тваіх зямля насычаецца.
14 Ты ўзрошчваеш траву для скаціны і расьліны для працы чалавеку, каб вырастаў хлеб з зямлі
15 і віно, якое сэрца людзям весяліць, і алей, ад якога твар іх блішчыць, і хлеб, які сэрца людзей умацоўвае.
16 Насычаюцца дрэвы ГОСПАДА, кедры Лібанскія, якія Ён пасадзіў.
17 Там птушкі робяць гнёзды, бусел на кіпарысе [мае] дом свой.
18 Высокія горы — для сарнаў, скалы — прыстанішча для даманаў.
19 Ён месяц зрабіў, [каб вызначаць] пару; сонца ведае захад свой.
20 Ты цемру кладзеш, і стаецца ноч, у ёй рухаюцца ўсе зьвяры лясныя.
21 Львяняты рыкаюць пра здабычу, шукаючы ў Бога пажывы.

22 Як узыйдзе сонца, яны зьбіраюцца разам і ў логвах залягаюць.
23 Выходзіць чалавек на дзеі свае і на працу сваю аж да вечара.
24 Якія шматлікія, ГОСПАДЗЕ, дзеі Твае! Усё Ты ў мудрасьці ўчыніў, зямля поўная даброцьцяў Тваіх.
25 Вось мора, вялікае і шырокае на абодва бакі. Там рухаецца безьліч жывёлаў малых і вялікіх.
26 Там караблі ходзяць. Левіятан, якога Ты ўфармаваў, гуляе ў ім.
27 Усе яны ўзіраюцца на Цябе, каб Ты даў ім пажыву ў свой час.
28 Ты даеш ім, яны зьбіраюць; Ты адкрываеш руку Тваю, і яны дабром насычаюцца.
29 Ты хаваеш аблічча Тваё, і яны палохаюцца; забіраеш дух іхні, і яны паміраюць, і ў пыл назад вяртаюцца.
30 Ты пашлеш Дух Твой, і яны створаныя, і Ты аднаўляеш аблічча зямлі.
31 Няхай будзе слава ГОСПАДА на вякі, няхай радуецца ГОСПАД з дзеяў Сваіх.
32 Ён гляне на зямлю, і яна дрыжыць; дакранецца да гор, і яны палаюць.
33 Буду сьпяваць ГОСПАДУ жыцьцём маім; буду выслаўляць Бога майго яшчэ больш.
34 Няхай будзе салодкім Яму разважаньне маё, а я буду весяліцца ў ГОСПАДЗЕ.
35 Няхай грэшнікі счэзнуць з зямлі, няхай больш ня будзе бязбожнікаў! Дабраславі, душа мая, ГОСПАДА! Альлелюя!

Пс 105

1 Слаўце ГОСПАДА, клічце імя Ягонае! Паведамляйце між народамі пра дзеі Ягоныя!
2 Сьпявайце Яму, выслаўляйце Яго! Размаўляйце пра ўсе цудоўныя дзеі Ягоныя!
3 Хвалецеся імем Яго сьвятым! Няхай весяліцца сэрца тых, што шукаюць ГОСПАДА.
4 Шукайце ГОСПАДА і сілу Ягоную, шукайце аблічча Ягонае заўсёды!
5 Узгадвайце цудоўныя дзеі Ягоныя, якія Ён зрабіў, цуды Ягоныя і прысуды вуснаў Ягоных,
6 вы, насеньне Абрагама, слугі Ягонага, сыны Якуба, выбранца Ягонага!
7 Ён — ГОСПАД, Бог наш; над усёй зямлёй суды Ягоныя.
8 Ён памятае на вякі запавет Свой, слова, якое загадаў на тысячу пакаленьняў,
9 якое заключыў з Абрагамам, і прысягу Сваю Ісааку.
10 І паставіў Якубу як пастанову, Ізраілю — як запавет вечны,
11 кажучы: «Табе Я дам зямлю Ханаан, [пакладу] шнур спадчыны вашай»,
12 калі было ў іх людзей мала на лік, вельмі мала, калі яны жылі там
13 і пераходзілі ад народу да народу, ад [аднаго] валадарства да другога народу.
14 Не дазваляў Ён ніякаму чалавеку прыгнятаць іх, і караў дзеля іх валадароў,
15 [кажучы]: «Не чапайце памазанцаў Маіх, і прарокам Маім не рабіце благога!»
16 І паклікаў Ён голад на зямлю, усякую падпору хлеба зламаў,
17 і паслаў перад абліччам іхнім чалавека, які быў прададзены як нявольнік, Яззэпа.
18 Зашчамілі ў кайданы ногі ягоныя, жалезам сьціснулі душу ягоную
19 аж да часу, калі выйшла справа ягоная, слова ГОСПАДА ачысьціла яго.
20 Валадар паслаў, каб звольніць яго; той, што пануе над народамі, вызваліў яго,
21 паставіў яго гаспадаром над домам сваім і [чалавекам], што пануе над усім даброцьцем ягоным,
22 каб скіроўваў князёў ягоных паводле [рашэньня] душы сваёй, і старшыняў ягоных вучыў мудрасьці.
23 І прыйшоў Ізраіль у Эгіпет, і Якуб пасяліўся ў зямлі Хама.
24 І [Бог] зрабіў вельмі плодным народ Свой, і зрабіў яго мацнейшым за прыгнятальнікаў ягоных.
25 Зьмяніў сэрца іхняе, каб ненавідзелі народ Ягоны, каб змовіліся супраць слугаў Ягоных.
26 Ён паслаў Майсея, слугу Свайго, Аарона, якога выбраў Сабе.
27 Ён зьявіў праз іх знакі Свае і цуды Свае ў зямлі Хама.
28 Ён паслаў цемру, і зрабілася цёмна, і не маглі працівіцца слову Ягонаму.
29 Ён перамяніў воды іхнія ў кроў, і памерлі рыбы іхнія.

30 Напоўнілася зямля іхняя жабамі, нават у спальнях валадароў іхніх.
31 Сказаў, і наляцелі мухі і камары ў-ва ўсіх межах іхніх.
32 Ён даў ім [замест] дажджу град, полымя агню на зямлю іхнюю.
33 Пабіў вінаградныя лозы іхнія і дрэвы фігавыя, і паламаў дрэвы ў межах іхніх.
34 Сказаў, і прыйшла саранча, і хрушчоў безьліч,
35 і яны паелі ўсе расьліны ў зямлі іхняй, і паелі плады палёў іхніх.
36 Ён пабіў усіх першародных у зямлі іхняй, зачаткі ўсёй сілы іхняй.
37 А іх вывеў са срэбрам і золатам, і не было ў каленах іхніх нядужага.
38 Радаваўся Эгіпет з выхаду іхняга, бо ахапіў іх страх перад імі.
39 Ён хмару разгарнуў, як заслону, і агонь, каб ноч асьвятляць.
40 Зажадалі, і прывёў перапёлак, і хлебам нябесным насычаў іх.
41 Ён рашчапіў скалу, і лінулі воды, і ракой пацяклі па сухой [зямлі].
42 Бо Ён узгадаў слова сьвятое Сваё да Абрагама, слугі Свайго,
43 і вывеў народ Свой у радасьці, выбранцаў Сваіх — са сьпяваньнем.
44 І даў ім зямлю народаў, і набытак народаў успадкаемілі яны,
45 каб захоўвалі пастановы Ягоныя і законаў Ягоных трымаліся. Альлелюя!

Пс 106

1 Альлелюя! Хвалеце ГОСПАДА, бо Ён добры, бо міласэрнасьць Ягоная на вякі.
2 Хто выкажа магутнасьць ГОСПАДА, дасьць пачуць усю хвалу Ягоную?
3 Шчасьлівыя тыя, што захоўваюць суд і робяць праведнасьць у кожным часе.
4 Памятай пра мяне, ГОСПАДЗЕ, праз ласкавасьць да народу Твайго! Наведай мяне са збаўленьнем Тваім,
5 каб я ўгледзеў дабро выбранцаў Тваіх, каб я радаваўся радасьцю народу Твайго, каб хваліўся разам са спадчынаю Тваёю!
6 Саграшылі мы разам з бацькамі нашымі, правініліся і адступіліся.
7 Бацькі нашыя ў Эгіпце не зразумелі цудаў Тваіх, ня памяталі мноства міласэрнасьці Тваёй, бунтаваліся каля мора, пры моры Чырвоным.
8 Але Ён збавіў іх дзеля імя Свайго, каб зьявіць магутнасьць Сваю.
9 Ён утаймаваў мора Чырвонае, і яно высахла; і Ён правёў іх праз бяздоньне як праз пустыню.
10 І збавіў іх з рукі ненавісьніка, і выбавіў іх з рукі ворага.
11 І пакрылі воды прыгнятальнікаў іхніх, ніводзін з іх не застаўся.
12 І хоць яны паверылі словам Ягоным і сьпявалі хвалу Яму,
13 але хутка забыліся пра дзеі Ягоныя, не чакалі на раду Ягоную.
14 І зажадалі жаданьнем у пустыні, і выпрабоўвалі Бога ў [зямлі] бязьлюднай.
15 І Ён даў ім тое, чаго хацелі, і спаслаў зьнемажэньне ў душу іхнюю.
16 І пазайздросьцілі Майсею ў табары, і Аарону, сьвятому ГОСПАДА.
17 Расчынілася зямля, і праглынула Датана, і пакрыла грамаду Авірама,
18 і загарэўся агонь пад грамадою іхняю, полымя спаліла бязбожнікаў.
19 Яны зрабілі цяля пад Харэвам і пакланяліся перад літым [ідалам];
20 і замянілі Славу сваю на вобраз вала, які есьць траву.
21 Яны забыліся на Бога, Збаўцу свайго, Які вялікае ўчыніў у Эгіпце,
22 цуды ў зямлі Хама, страшныя [рэчы] каля мора Чырвонага.
23 І сказаў Ён, што вынішчыць іх, калі б не Майсей, выбранец Ягоны, які стаў у выломе перад абліччам Ягоным, каб адвярнуць ярасьць Ягоную, каб Ён ня вынішчыў іх.
24 І пагрэбавалі яны зямлёй пажаданай, не паверылі словам Ягоным.
25 І наракалі ў намётах сваіх, ня слухаліся голасу ГОСПАДА.
26 І Ён падняў руку Сваю на іх, каб пападалі яны ў пустыні,
27 і пападала насеньне іхняе сярод народаў, І Ён расьцярушыў іх па зямлі.

28 І яны далучыліся да Баал-Пэгора, і елі ахвяры мёртвых,
29 і злавалі [Яго] дзеяньнямі сваімі, і абрынулася на іх пляга.
30 І паўстаў Пінхас, і спынілася пляга.
31 І залічана яму гэта за праведнасьць з пакаленьня ў пакаленьне на вякі.
32 І ўгнявілі яны [Бога] каля водаў Мэрывы, і з-за іх пацярпеў Майсей,
33 бо бунтаваліся супраць духа ягонага, і ён неразважна гаварыў вуснамі сваімі.
34 Яны ня зьнішчылі народаў, як ім казаў ГОСПАД,
35 і зьмяшаліся з паганамі, і навучыліся справаў іхніх,
36 і служылі ідалам іхнім, і яны сталіся для іх пасткаю,
37 і ахвяроўвалі сыноў сваіх і дачок сваіх дэманам,
38 і пралівалі кроў бязьвінную, кроў сыноў сваіх і дачок сваіх, якую ахвяроўвалі ідалам Ханаанскім, і апаганілася зямля ад крыві.
39 І апаганілі сябе ўчынкамі сваімі, чужаложылі ў дзеяньнях сваіх.
40 І распаліўся гнеў ГОСПАДА на народ Ягоны, і абрыдла Яму спадчына Ягоная.
41 І Ён аддаў іх у рукі паганаў, і запанавалі над імі тыя, што ненавідзелі іх.
42 І ўціскалі іх ворагі іхнія, і яны скарыліся пад рукою іхняю.
43 Шмат разоў Ён выратоўваў іх, але яны бунтаваліся ў задумах сваіх і паніжаны былі за беззаконьне сваё.
44 Але Ён глянуў на іх у горы іх, пачуўшы галашэньне іхняе,
45 і ўзгадаў на іх дзеля запавету Свайго, і пашкадаваў іх дзеля мноства міласэрнасьці Сваёй,
46 і Ён даў літасьць да іх перад абліччам усіх, што паняволілі іх.
47 Збаў нас, ГОСПАДЗЕ, Божа наш, і зьбяры нас ад паганаў, каб мы славілі сьвятое імя Тваё і хваліліся славай Тваёю!
48 Дабраслаўлёны ГОСПАД, Бог Ізраіля, ад веку і на вякі! І няхай скажа ўвесь народ: «Амэн! Альлелюя!»

Пс 107

1 Слаўце ГОСПАДА, бо Ён добры, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная!
2 Няхай гэтак скажуць выкупленыя ГОСПАДАМ, якіх Ён выкупіў з рукі прыгнятальніка
3 і сабраў з земляў з усходу і з захаду, з поўначы і ад мора.
4 Яны блукалі па пустыні, па бязьлюдзьдзі, шляху да гораду, дзе будуць жыць, не знайшлі.
5 Былі галоднымі і сасьмяглымі, душа іхняя ў іх зьнемаглася.
6 І крычалі яны да ГОСПАДА ў тузе сваёй, і Ён выратаваў іх з бяды іхняй.
7 І павёў Ён іх шляхам простым, каб прыйшлі да гораду, дзе будуць жыць.
8 Няхай славяць ГОСПАДА за міласэрнасьць Ягоную і за цуды Ягоныя для сыноў чалавечых,
9 бо Ён насыціў душу спрагнёную і душу галодную напоўніў дабром.
10 Яны сядзелі ў цемры і ў ценю сьмерці, увязьненыя пакутамі і жалезам,
11 бо яны бунтаваліся супраць словаў Бога і радай Найвышэйшага пагрэбавалі.
12 І Ён упакорыў сэрца іхняе нядоляй; яны спатыкнуліся, і не было дапамогі.
13 І крычалі яны да ГОСПАДА ў тузе сваёй, і Ён выратаваў іх з бяды іхняй.
14 Ён вывеў іх з цемры і ценю сьмерці, і кайданы іхнія парваў.
15 Няхай славяць ГОСПАДА за міласэрнасьць Ягоную і за цуды Ягоныя для сыноў чалавечых,
16 бо Ён скрышыў брамы мядзяныя і расьсек засаўкі жалезныя.
17 Яны [былі] неразумнымі на шляху правінаў сваіх і за беззаконьні свае пакутавалі.
18 Усякая ежа абрыдла душы іхняй, і блізка былі яны ад брамаў сьмерці.
19 І крычалі яны да ГОСПАДА ў тузе сваёй, і Ён выратаваў іх з бяды іхняй.
20 Ён паслаў слова Сваё, і аздаравіў іх, і выбавіў іх ад магілы.
21 Няхай славяць ГОСПАДА за міласэрнасьць Ягоную і за цуды Ягоныя для сыноў чалавечых!
22 Няхай ахвяруюць ахвяры падзякі, і няхай абвяшчаюць з радасьцю пра дзеяньні Ягоныя!
23 Тыя, што зыходзілі на мора на караблях і вялі справы на водах вялікіх,

24 яны бачылі справы ГОСПАДА і цуды Ягоныя ў глыбінях.
25 Ён сказаў, і стаўся вецер бурны, і ўзьняліся хвалі,
26 і яны ўздымаюцца пад неба, і падаюць у бяздоньне; душа іхняя ў [гэтым] ліху млее,
27 бадзяюцца і хістаюцца, як п'яныя, і ўся мудрасьць іхняя марная.
28 І крычалі яны да ГОСПАДА ў тузе сваёй, і Ён выратаваў іх з бяды іхняй.
29 Ён перамяніў буру ў цішу, і суцішыліся хвалі.
30 І ўзрадаваліся яны, што [ўсё] сьціхла, і Ён іх прывёў да жаданай прыстані.
31 Няхай славяць ГОСПАДА за міласэрнасьць Ягоную і за цуды Ягоныя для сыноў чалавечых!
32 Няхай вывышаюць Яго ў зборы народу і паміж старшыняў няхай хваляць Яго!
33 Ён перамяніў рэкі ў пустыню і крыніцы водаў — у сухую зямлю,
34 і ўрадлівую зямлю — у салёную, за ліхоту тых, што жывуць на ёй.
35 Ён перамяніў пустыню ў возера водаў і сухую зямлю — у крыніцы водаў,
36 і там пасяліў галодных, і яны паставілі горад, дзе будуць жыць,
37 і засеялі палі, і пасадзілі вінаграднік, і атрымалі плод багаты.
38 І Ён дабраслаўляў іх, і яны множыліся вельмі; і не зьмяншалася ў іх скаціны.
39 Але [пасьля] іх паменшала, і яны схіліліся пад цяжарам ліхоты і смутку.
40 Ён вылівае пагарду на князёў і кідае іх блукаць па пустках без дарогі.
41 Ён падымае прыгнечанага з нэндзы, і робіць плямёны як [чароды] авечак.
42 Убачаць гэта правыя і ўзьвесяляцца; і ўсякая несправядлівасьць закрые вусны свае.
43 Хто мудры, той гэта захавае, і зразумее міласэрнасьць ГОСПАДА!

Пс 108

1 Сьпеў. Псальм Давіда.
2 Умацаванае сэрца маё, Божа! Буду сьпяваць і выслаўляць [Цябе] ў славе маёй!
3 Збудзіцеся, псалтыр і гусьлі! Я пабуджу сьвітаньне!
4 Буду славіць Цябе сярод людзей, ГОСПАДЗЕ, і буду выслаўляць Цябе сярод народаў,
5 бо па-над неба вялікая міласэрнасьць Твая, і праўда Твая — да аблокаў.
6 Узьвялічся па-над неба, Божа, і па-над усёй зямлёй [няхай будзе] слава Твая!
7 Каб былі ўратаваныя ўмілаваныя Твае, збаў правіцай Тваёй і адкажы мне!
8 Бог сказаў у сьвятасьці Сваёй: «Я ўзрадуюся! Я падзялю Сыхем і даліну Сукот разьмераю.
9 Мой Гілеад, Мой Манаса, і Эфраім — моц галавы Маёй! Юда — заканадаўца Мой!
10 Мааў — міса для мыцьця Майго; на Эдом кіну сандалы Мае; над [зямлёй] Філістынскай радасна гукаць буду!»
11 Хто ўвядзе мяне ў горад умацаваны? Хто завядзе мяне ў Эдом?
12 Ці ж ня Ты, Божа, нас пакінуў і не выходзіш, Божа, з войскамі нашымі?
13 Дай нам успамогу ў прыгнечаньні [нашым], бо марны ратунак чалавечы.
14 З Богам мы зьявім сілу, і Ён растопча прыгнятальнікаў нашых.

Пс 109

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда. Божа, хвала мая, не маўчы!
2 Бо вусны бязбожныя і вусны здрадлівыя расчыніліся супраць мяне, гавораць са мною языком хлусьлівым.
3 І словамі нянавісьці атачылі мяне, і ваююць супраць мяне без прычыны.
4 За любоў маю яны супрацьстаяць мне, а я малюся.
5 Яны заплацілі мне злом за дабро, і нянавісьцю — за любоў маю.
6 Пастаў над ім бязбожніка, і шатан няхай стане праваруч яго;
7 калі будзе суджаны, няхай будзе як бязбожнік, а малітва ягоная няхай станецца грэхам.
8 Няхай дні ягоныя будуць кароткія, а ўрад ягоны няхай возьме іншы.
9 Няхай сыны ягоныя будуць сіротамі, а жонка ягоная — удавою.

10 Няхай будуць выгнаныя як выгнанцы сыны ягоныя, і няхай жабруюць і шукаюць [хлеба] на руінах сваіх!
11 Няхай захопіць ліхвяр усё, што яму належыць, і няхай чужынцы захопяць працу ягоную.
12 Няхай ня будзе нікога, хто яму зьявіць міласэрнасьць, і няхай ня будзе таго, хто зьлітуецца над сіротамі ягонымі.
13 Насеньне ягонае няхай будзе зьнішчана; у пакаленьні наступным няхай будзе выкрэсьленае імя ягонае!
14 Няхай будзе ўзгаданае беззаконьне бацькоў ягоных перад ГОСПАДАМ, і грэх маці ягонай няхай ня будзе змыты!
15 Няхай будуць яны перад ГОСПАДАМ заўсёды, і няхай Ён вынішчыць на зямлі памяць пра яго,
16 бо ён ня памятаў, каб чыніць міласэрнасьць, і перасьледаваў чалавека беднага, і прыгнечанага, і з сэрцам зламаным, каб забіць яго.
17 Любіў ён праклён, і ён прыйдзе на яго! Не было даспадобы яму дабраслаўленьне, і яно будзе далёка ад яго!
18 І ён апранецца ў праклён, быццам у шату сваю, і [праклён] увойдзе, як вада, у нутро ягонае, і як алей — у косткі ягоныя!
19 Няхай будзе для яго як адзеньне, у якое ён апранаецца, і як пас, якім заўсёды падпярэзваецца!
20 Гэткая будзе плата ад ГОСПАДА для тых, што супрацьстаяць мне, і для тых, што благое гавораць супраць душы маёй!
21 А Ты, ГОСПАДЗЕ, Госпадзе, учыні са мною дзеля імя Твайго, і выратуй мяне, бо добрая міласэрнасьць Твая,
22 бо я бедны і прыгнечаны, і сэрца маё ў нутры маім зранена.
23 Я зыходжу, як цень, што зьнікае; ганяюць мяне, як саранчу.
24 Калені мае ад посту хістаюцца, і цела маё ссохла без алею.
25 І я стаўся ганьбаю для іх, яны глядзяць на мяне, ківаючы галовамі сваімі.
26 Дапамажы мне, ГОСПАДЗЕ, Божа мой! Збаў мяне паводле міласэрнасьці Тваёй!
27 І даведаюцца яны, што гэта рука Твая, што Ты, ГОСПАДЗЕ, зрабіў гэта!
28 Яны праклінаюць, а Ты дабраславі! Яны паўстаюць [супраць мяне], і будуць асаромленыя, а слуга Твой няхай узрадуецца!
29 Няхай апрануцца ў зьнявагу тыя, што супрацьстаяць мне, і ахінуцца, быццам плашчом, у сорам свой!
30 Я буду гучна славіць ГОСПАДА вуснамі маімі і сярод мноства [народу] буду хваліць Яго,
31 бо Ён стаіць праваруч прыгнечанага, каб збавіць яго ад тых, што асуджаюць душу ягоную.

Пс 110

1 Псальм Давіда. Сказаў ГОСПАД Госпаду майму: «Сядзь праваруч Мяне, пакуль пакладу ворагаў Тваіх як падножжа пад стопы Твае!»
2 Кій моцы тваёй пашле ГОСПАД з Сыёну: «Мей уладу сярод ворагаў тваіх!»
3 Народ твой у дзень магутнасьці тваёй ахвотна зьбярэцца ў аздобе сьвятой; як раса з улоньня сьвітаньня будзе маладосьць твая.
4 Прысягнуў ГОСПАД і не раскаецца: «Ты — сьвятар на вякі паводле парадку Мэльхісэдэка».
5 Госпад праваруч цябе ў дзень гневу Свайго скрышыць валадароў,
6 будзе судзіць народы, усё напоўніць трупамі, скрышыць галаву, што пануе над многімі землямі.
7 Са струменя нап’ецца ў дарозе і дзеля таго ўзвысіць галаву.

Пс 111

1 Альлелюя! Буду славіць ГОСПАДА ўсім сэрцам на нарадзе правых і ў грамадзе.
2 Вялікія дзеяньні ГОСПАДА, годныя ўвагі ўсіх, што імкнуцца да іх.
3 Годнасьць і велічнасьць — справы Ягоныя, і праведнасьць Ягоная будзе трываць вечна.

4 Ён памятнымі зрабіў цуды Свае, ГОСПАД літасьцівы і спагадлівы.
5 Ён ежу дае тым, што баяцца Яго, памятае на вякі запавет Свой.
6 Ён распавёў народу Свайму пра сілу дзеяньняў Сваіх, даючы яму спадчыну народаў.
7 Дзеі рук Ягоных — праўда і суд; усе загады Ягоныя верныя,
8 замацаваныя на вякі вечныя, зробленыя ў праўдзе і справядлівасьці.
9 Збаўленьне паслаў Ён народу Свайму, пастанавіў на вякі запавет Свой; сьвятое і страшнае імя Ягонае!
10 Страх перад ГОСПАДАМ — пачатак мудрасьці; добры розум [маюць] усе, што дзейнічаюць [у страху Божым]. Хвала Ягоная трывае вечна.

Пс 112

1 Альлелюя! Шчасьлівы той чалавек, які баіцца ГОСПАДА і ў прыказаньнях Ягоных мае ўпадабаньне вялікае.
2 Магутным будзе на зямлі насеньне ягонае; пакаленьне правых будзе дабраслаўлёнае.
3 Маёмасьць і багацьце ў доме ягоным, і праведнасьць ягоная будзе трываць вечна.
4 Узыходзіць у цемры сьвятло правым, літасьцівы і спагадлівы, і праведны [Бог].
5 Добра чалавеку, які літуецца і пазычае, які справы свае вядзе згодна з судом.
6 Бо ён ніколі не пахісьнецца; у вечнай памяці будзе праведнік.
7 Ня будзе баяцца, чуючы вестку благую; моцнае сэрца ягонае, ён спадзяецца на ГОСПАДА.
8 Умацаванае сэрца ягонае, ён ня будзе баяцца, аж пакуль угледзіць [загубу] прыгнятальнікаў сваіх.
9 Раскідаў, раздаў бедным; праведнасьць ягоная трывае вечна, рог ягоны ўзьнімецца ў славе.
10 Угледзіць гэта бязбожнік і будзе злаваць, скрыгатаць ён будзе зубамі і змарнее, і жаданьне бязбожніка загіне.

Пс 113

1 Альлелюя! Хвалеце, слугі ГОСПАДА, хвалеце імя ГОСПАДА!
2 Няхай будзе дабраслаўлёнае імя ГОСПАДА ад цяпер і на вякі!
3 Ад усходу сонца да захаду яго няхай будзе хвалёнае імя ГОСПАДА!
4 Узьвялічаны ГОСПАД над усімі народамі; па-над нябёсы слава Ягоная.
5 Хто як ГОСПАД, Бог наш, Які жыве ў вышыні
6 і схіляецца, каб паглядзець на неба і зямлю;
7 Які з пылу падымае гаротніка, з гною ўзносіць беднага,
8 каб пасадзіць яго сярод магнатаў, сярод магнатаў народу Свайго;
9 Які бясплодную садзіць у доме як маці, якая радуецца сынам [сваім]? Альлелюя!

Пс 114

1 Калі выходзіў Ізраіль з Эгіпту, дом Якуба з народу чужынскага,
2 стаўся Юда сьвятыняй Ягонай, Ізраіль — [месцам] панаваньня Ягонага.
3 Мора ўбачыла і ўцякло, Ярдан павярнуў назад.
4 Горы скакалі, быццам бараны, узгоркі — быццам ягняты.
5 Што табе, мора, што ты ўцякло? Ты, Ярдане, што павярнуў назад?
6 Што вы скачаце, горы, быццам бараны, узгоркі — быццам ягняты?
7 Перад абліччам Госпада задрыжэла зямля, перад абліччам Бога Якуба,
8 Які перамяняе скалу ў возера воднае, крэмень — у крыніцу водаў.

Пс 115

1 Ня нам, ГОСПАДЗЕ, ня нам, але іменьню Твайму дай Ты славу дзеля міласэрнасьці Тваёй, дзеля праўды Тваёй!
2 Навошта казаць паганам: «Дзе ж Бог іхні?»
3 А Бог наш у небе; усё, што Яму даспадобы, Ён робіць.

4 Ідалы іхнія — срэбра і золата, творы рук чалавечых.
5 Маюць вусны, і не гавораць; маюць вочы, і ня бачаць;
6 маюць вушы, і ня чуюць, маюць ноздры, і нюху няма;
7 рукі ў іх, і ня мацаюць; ногі ў іх, і ня ходзяць; і не выказваюцца горлам сваім.
8 Няхай стануцца падобнымі да іх тыя, што іх робяць, усе, што на іх спадзяюцца.
9 Ізраілю, спадзявайся на ГОСПАДА. Ён — дапамога іхняя і шчыт іх!
10 Доме Аарона, спадзявайся на ГОСПАДА. Ён — дапамога іхняя і шчыт іх!
11 Вы, што ГОСПАДА баіцёся, спадзявайцеся на ГОСПАДА. Ён — дапамога іхняя і шчыт іх!
12 ГОСПАД памятае пра нас. Ён будзе дабраслаўляць, Ён будзе дабраслаўляць дом Ізраіля, Ён будзе дабраслаўляць дом Аарона,
13 Ён будзе дабраслаўляць тых, што баяцца ГОСПАДА, разам малых і вялікіх.
14 Няхай памножыць вас ГОСПАД, вас і сыноў вашых.
15 Дабраслаўлёныя вы ГОСПАДАМ, Які стварыў неба і зямлю.
16 Неба — неба ГОСПАДА, а зямлю Ён даў сынам чалавечым.
17 Ня мёртвыя хваляць ГОСПАДА, ня ўсе тыя, што зыходзяць у [месца] маўчаньня,
18 але мы будзем дабраслаўляць ГОСПАДА ад цяпер і на вякі. Альлелюя!

Пс 116

1 Люблю ГОСПАДА, бо Ён пачуў голас мой і маленьне маё,
2 бо Ён прыхіліў да мяне вуха Сваё ў дзень, калі я клікаў [Яго].
3 Ахапілі мяне путы сьмерці; мукі пякельныя адшукалі мяне; я знайшоў трывогу і смутак.
4 І паклікаў я імя ГОСПАДА: «Выратуй, прашу, ГОСПАДЗЕ, душу маю!»
5 Літасьцівы ГОСПАД і праведны, наш Бог міласьцівы.
6 ГОСПАД захоўвае неразумных; і калі зьнемагаю, Ён ратуе мяне.
7 Вярніся, душа мая, да супачынку твайго, бо ГОСПАД робіць добрае табе.
8 Бо Ты выратаваў душу маю ад сьмерці, вочы мае — ад сьлёзаў, ногі мае — ад падзеньня.
9 Буду хадзіць перад абліччам ГОСПАДА ў зямлі жывых.
10 Я веру, дык гавару: «Я моцна прыгнечаны».
11 Я сказаў у зьбянтэжанасьці маёй: «Усе людзі хлусяць!»
12 Што я вярну ГОСПАДУ за ўсе дабрадзействы Ягоныя для мяне?
13 Келіх збаўленьня ўзьніму і імя ГОСПАДА буду клікаць.
14 Абяцаньні мае ГОСПАДУ споўню перад усім народам Ягоным.
15 Каштоўная ў вачах ГОСПАДА сьмерць багабойных Ягоных.
16 О ГОСПАДЗЕ! Я ж — слуга Твой, я — слуга Твой, сын служкі Тваёй! Ты разьбіў кайданы мае.
17 Табе ахвярую ахвяру падзякі і імя ГОСПАДА буду клікаць.
18 Абяцаньні мае ГОСПАДУ споўню перад усім народам Ягоным,
19 у панадворках Дому ГОСПАДА, пасярод цябе, Ерусаліме! Альлелюя!

Пс 117

1 Хвалеце ГОСПАДА, усе народы! Праслаўляйце Яго, усе плямёны!
2 Бо вялікая над намі міласэрнасьць Ягоная, і праўда ГОСПАДА на вякі! Альлелюя!

Пс 118

1 Слаўце ГОСПАДА, бо Ён добры, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная!
2 Няхай скажа Ізраіль, што на вякі міласэрнасьць Ягоная!
3 Няхай скажа дом Аарона, што на вякі міласэрнасьць Ягоная!
4 Няхай скажуць тыя, што баяцца ГОСПАДА, што на вякі міласэрнасьць Ягоная!
5 У муках клікаў я ГОСПАДА, і Ён адказаў мне, Госпад [вывеў мяне] на вольны прастор.
6 ГОСПАД са мною, я не баюся. Што зробіць мне чалавек?
7 ГОСПАД са мною, Ён — дапамога мая, і я буду глядзець [на загубу] тых, што мяне ненавідзяць.

8 Лепш мець надзею на ГОСПАДА, чым спадзявацца на чалавека.
9 Лепш мець надзею на ГОСПАДА, чым спадзявацца на магнатаў.
10 Усе народы мяне абступілі, але імем ГОСПАДА я перамог іх.
11 Абступілі мяне, абступілі, але імем ГОСПАДА я перамог іх.
12 Абселі мяне, быццам пчолы, і згарэлі яны, як агонь з цярніны, бо імем ГОСПАДА я перамог іх.
13 Пхаючы, папхнулі мяне, каб я ўпаў, але ГОСПАД дапамог мне.
14 ГОСПАД — моц мая і песьня мая, Ён стаўся збаўленьнем маім.
15 Голас радасьці і збаўленьня — у намётах праведнікаў. Правіца ГОСПАДА зьявіла сілу.
16 Правіца ГОСПАДА ўзьнесена, правіца ГОСПАДА зьявіла сілу.
17 Не памру, але буду жыць і буду абвяшчаць пра дзеяньні ГОСПАДА.
18 Караючы, пакараў мяне ГОСПАД, але сьмерці мяне не аддаў.
19 Адчыніце мне брамы праведнасьці; я ўвайду праз іх і буду славіць ГОСПАДА.
20 Вось брама ГОСПАДА; праведнікі ўвойдуць праз яе.
21 Буду славіць Цябе, бо Ты адказаў мне і стаўся збаўленьнем маім!
22 Камень, які адкінулі будаўнікі, стаўся галавой вугла.
23 Ад ГОСПАДА гэта сталася, і [гэта] цуд у вачах нашых!
24 Вось дзень, які стварыў ГОСПАД; будзем весяліцца і радавацца ў ім!
25 Прашу, ГОСПАДЗЕ, збаў цяпер! Прашу, ГОСПАДЗЕ, дай посьпех цяпер!
26 Дабраслаўлёны той, хто прыходзіць у імя ГОСПАДА; мы дабраслаўляем вас з Дому ГОСПАДА.
27 ГОСПАД ёсьць Бог, Ён асьвятліў нас; прывяжыце вяроўкамі сьвяточную [ахвяру] да рагоў ахвярніку!
28 Ты — Бог мой, Цябе я буду славіць, Цябе, Божа мой, вывышаць!
29 Слаўце ГОСПАДА, бо Ён — добры, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная!

Пс 119

1 Шчасьлівыя тыя, у якіх шлях беззаганны, якія ходзяць паводле Закону ГОСПАДА.
2 Шчасьлівыя тыя, што захоўваюць сьведчаньні Ягоныя, якія ўсім сэрцам шукаюць Яго,
3 якія ня робяць беззаконьня, і ходзяць шляхам Ягоным.
4 Ты загадаў, каб пільна захоўвалі загады Твае.
5 О, каб жа я ўмацаваў шлях мой, каб захоўваць пастановы Твае!
6 Тады я ня буду асаромлены, калі буду глядзець на ўсе прыказаньні Твае.
7 Буду славіць Цябе ў шчырасьці сэрца, калі буду вучыцца судам праведнасьці Тваёй.
8 Пастановы Твае я буду захоўваць, толькі не пакідай мяне!
9 Якім чынам юнак захавае ў чыстасьці сьцежку сваю? [Калі] будзе захоўваць [яе] паводле слова Твайго.
10 Усім сэрцам маім я шукаю Цябе, ня дай мне адхіліцца ад прыказаньняў Тваіх!
11 У сэрцы маім я хаваю слова Тваё, каб не зграшыць супраць Цябе.
12 Дабраслаўлёны Ты, ГОСПАДЗЕ! Навучы мяне пастановам Тваім!
13 Вуснамі маімі абвяшчаю ўсе прысуды вуснаў Тваіх.
14 На шляху сьведчаньняў Тваіх я радуюся больш, чым ад усялякіх каштоўнасьцяў.
15 Пра пастановы Твае буду разважаць і буду глядзець на сьцежкі Твае.
16 У пастановах Тваіх будзе пацяшэньне маё, не забудуся слова Твайго.
17 Рабі добрае слузе Твайму, каб я жыў і захоўваў слова Тваё.
18 Расчыні вочы мае, і буду глядзець на цудоўныя дзеяньні закону Твайго!
19 Я — прыхадзень на зямлі; не хавай ад мяне прыказаньні Твае!
20 Зьнемаглася душа мая, прагнучы ўвесь час судоў Тваіх.
21 Ты ўтаймаваў свавольнікаў, якія праклятыя, бо ўхіляюцца ад прыказаньняў Тваіх.
22 Аддалі ад мяне ганьбу і пагарду, бо я захоўваю сьведчаньні Твае.

23 Нават калі засядуць князі і будуць змаўляцца супраць мяне, слуга Твой будзе разважаць пра
пастановы Твае.
24 Бо сьведчаньні Твае — пацеха мая і рада.
25 Прыліпла да пылу душа мая; ажыві мяне паводле слова Твайго.
26 Пра шляхі мае я апавядаў, і Ты адказаў мне; навучы мяне пастановам Тваім.
27 Дай мне зразумець шлях загадаў Тваіх, і я буду разважаць пра цуды Твае.
28 Сьлёзы ліе душа мая ад смутку, узьнімі мяне паводле слова Твайго!
29 Шлях хлусьні аддалі ад мяне, і Закон Твой няхай будзе літасьцівы да мяне.
30 Я выбраў шлях вернасьці, суды Твае паставіў [перад вачыма].
31 Я прыляпіўся да сьведчаньняў Тваіх; ГОСПАДЗЕ, ня дай мне асароміцца!
32 Шляхам прыказаньняў Тваіх я пабягу, бо Ты пашыраеш сэрца маё.
33 Навучы мяне, ГОСПАДЗЕ, шляху пастановаў Тваіх, і я буду пільнавацца яго аж да канца.
34 Дай мне разуменьне, і буду пільнавацца Закону Твайго і захоўваць яго ўсім сэрцам.
35 Вядзі мяне па сьцежцы прыказаньняў Тваіх, бо ў гэтым упадабаньне маё.
36 Нахіляй сэрца маё да сьведчаньняў Тваіх, а не да прыбытку.
37 Адвярні вочы мае, каб на марнасьць не глядзелі; ажыві мяне на шляхах Тваіх!
38 Няхай паўстане слова Тваё для слугі Твайго, які [ходзіць у] страху Тваім.
39 Аддалі ад мяне ганьбу, якой баюся, бо суды Твае добрыя.
40 Вось, я прагну загадаў Тваіх; ажыві мяне праведнасьцю Тваёй.
41 Няхай прыйдзе да мяне міласэрнасьць Твая, ГОСПАДЗЕ, і збаўленьне Тваё паводле слова
Твайго,
42 каб я мог адказаць словам таму, хто зьневажае мяне, бо я спадзяюся на слова Тваё.
43 І не пазбаў вусны мае слова праўды зусім, бо я на суды Твае спадзяюся.
44 І я буду захоўваць Закон Твой заўсёды, і на вякі вечныя,
45 і буду хадзіць па [прасторы] шырокім, бо загадаў Тваіх я шукаў.
46 І буду гаварыць пра сьведчаньні Твае перад валадарамі, і ня буду асаромлены.
47 І буду мець пацяшэньне ў прыказаньнях Тваіх, якія я ўзьлюбіў.
48 І буду ўздымаць рукі мае да прыказаньняў Тваіх, якія я ўзьлюбіў, і буду разважаць пра
пастановы Твае.
49 Узгадай слова да слугі Твайго, на якое маю спадзявацца.
50 Гэта пацяшэньне маё ў нядолі маёй, бо слова Тваё ажыўляе мяне.
51 Свавольнікі вельмі зьдзекуюцца з мяне; але я ад Закону Твайго не ўхіляўся.
52 Узгадваў я, ГОСПАДЗЕ, суды Твае спрадвечныя, і гэта пацяшала мяне.
53 [Гнеў] палючы мяне агарнуў на бязбожнікаў, якія пакінулі Закон Твой.
54 Пастановы Твае сталіся гімнам для мяне ў доме вандраваньня майго.
55 Імя Тваё, ГОСПАДЗЕ, я ўначы ўзгадваў і захоўваў Закон Твой.
56 Гэтак сталася са мною, бо я пільнаваўся загадаў Тваіх.
57 «Частка мая, ГОСПАДЗЕ, — сказаў я,— захоўваць слова Тваё».
58 Я прынізіўся перад абліччам Тваім ад усяго сэрца; зьлітуйся нада мною паводле слова
Твайго.
59 Я думаў пра шляхі мае, і зьвярнуў ногі мае да сьведчаньняў Тваіх.
60 Сьпяшаўся я і не марудзіў захоўваць прыказаньні Твае.
61 Путы бязбожнікаў аблыталі мяне, але Закон Твой я не забыўся.
62 Сярод ночы я ўстаю, каб славіць Цябе за суды праведнасьці Тваёй.
63 Я — супольнік для ўсіх, што баяцца Цябе і захоўваюць загады Твае.
64 Міласэрнасьць Твая, ГОСПАДЗЕ, напоўніла зямлю; навучы мяне пастановам Тваім!
65 Дабро Ты зрабіў слузе Твайму, ГОСПАДЗЕ, паводле слова Твайго.
66 Добраму розуму і веданьню навучы мяне, бо я прыказаньням Тваім веру.
67 Перш, чым я стаўся спакораным, я блукаў; цяпер слова Тваё я захоўваю.
68 Ты добры і робіш добрае, навучы мяне пастановам Тваім!

69 Свавольнікі надумалі хлусьню супраць мяне; а я ўсім сэрцам буду пільнавацца загадаў Тваіх.
70 Сталася нячулым ад тлушчу сэрца іхняе; а я меў пацяшэньне ў Законе Тваім.
71 Добра мне, што я быў упакораны, каб навучыўся пастановам Тваім.
72 Лепшы для мяне закон вуснаў Тваіх, чым тысячы золата і срэбра.
73 Рукі Твае зрабілі мяне і ўмацавалі; дай мне разуменьне, каб я навучыўся прыказаньням Тваім!
74 Тыя, што баяцца Цябе, убачаць мяне і ўзрадуюцца, бо я на слова Тваё спадзяюся.
75 Ведаю, ГОСПАДЗЕ, што праведныя суды Твае, і слушна Ты ўпакорыў мяне.
76 Няхай, прашу, міласэрнасьць Твая пацяшае мяне паводле слова Твайго да слугі Твайго.
77 Няхай прыйдзе да мяне літасьць Твая, каб я жыў, бо Закон Твой — пацеха мая.
78 Няхай будуць асаромлены свавольнікі, бо яны падманліва блыталі мяне; а я буду разважаць пра загады Твае.
79 Няхай да мяне навернуцца тыя, што баяцца Цябе, і тыя, што ведаюць сьведчаньні Твае.
80 Няхай будзе сэрца маё беззаганным у [выканаьні] пастановаў Тваіх, каб я ня быў асаромлены.
81 Зьнемагае душа мая без збаўленьня Твайго; на слова Тваё спадзяюся.
82 Зьнемагаюць вочы мае бяз слова Твайго, кажучы: «Калі ж Ты пацешыш мяне?»
83 Я стаўся, як мех [скураны] ў дыме; але пастановаў Тваіх не забыўся.
84 Колькі будзе дзён слугі Твайго, калі Ты ўчыніш суд над тымі, што перасьледуюць мяне?
85 Выкапалі свавольнікі яму для мяне, але гэта пярэчыць Закону Твайму.
86 Усе прыказаньні Твае — верныя; [з дапамогай] хлусьні перасьледуюць мяне, дапамажы Ты мне!
87 Амаль вынішчылі мяне на зямлі; а я не пакінуў загадаў Тваіх.
88 Праз міласэрнасьць Тваю захавай мне жыцьцё, і буду захоўваць сьведчаньні вуснаў Тваіх.
89 На вякі, ГОСПАДЗЕ, слова Тваё сьцьверджана на небе!
90 З пакаленьня ў пакаленьне вернасьць Твая; Ты ўгрунтаваў зямлю, і яна стаіць.
91 Паводле прысуду Твайго стаяць яны да гэтага дня, бо ўсё гэта — слугі Твае.
92 Калі б Закон Твой ня быў пацехай маёй, даўно б я згінуў у нядолі маёй.
93 На вякі не забудуся загадаў Тваіх, бо імі Ты захаваў мне жыцьцё.
94 Я — Твой! Збаў мяне, бо я шукаю загады Твае.
95 Цікуюць на мяне бязбожнікі, каб зьнішчыць мяне; а я пра сьведчаньні Твае разважаю.
96 Я бачыў заканчэньне ўсякай дасканаласьці; але прыказаньні Твае ня маюць канца.
97 Як я люблю Закон Твой! Увесь дзень ён у думках маіх!
98 Зрабілі мяне мудрэйшым за ворагаў маіх прыказаньні Твае, бо яны на вякі са мною.
99 Я стаўся больш разважлівым за ўсіх, што вучылі мяне, бо сьведчаньні Твае ў думках маіх.
100 Я стаўся разумнейшым за старых, бо пільнуюся загадаў Тваіх.
101 Ад усякай сьцежкі благой я стрымліваў ногі мае, каб захоўваць слова Тваё.
102 Ад прысудаў Тваіх я ня адступаўся, бо Ты мяне навучаеш.
103 Як салодкія словы Твае паднябеньню майму, саладзей за мёд вуснам маім!
104 Пра загады Твае буду разважаць, дзеля гэтага ненавіджу ўсякую сьцежку хлусьні.
105 Слова Тваё — сьветач для ног маіх і сьвятло на сьцежцы маёй.
106 Я прысягнуў і я падняўся, каб захоўваць суды праведнасьці Тваёй.
107 Я вельмі моцна прыгнечаны; ГОСПАДЗЕ, ажыві мяне паводле слова Твайго!
108 Мей упадабаньне, прашу, ГОСПАДЗЕ, у дабраахвотных [абяцаньнях] вуснаў маіх, і навучы мяне судам Тваім.
109 Душа мая заўсёды ў руцэ маёй, і Закон Твой я не забываюся.
110 Наставілі бязбожнікі пастку супраць мяне, але я не ўхіліўся ад загадаў Тваіх.
111 Я ўспадкаеміў сьведчаньні Твае на вякі, бо яны — радасьць сэрца майго.
112 Я нахіляю сэрца маё, каб рабіла паводле пастановаў Тваіх на вякі, аж да канца.

113 Двудушных я ненавіджу, а Закон Твой люблю.
114 Ты — заслона мая і шчыт мой, на слова Тваё спадзяюся.
115 Адыйдзіце ад мяне, злачынцы, каб я мог захоўваць прыказаньні Бога майго.
116 Падтрымай мяне паводле слова Твайго, і буду жыць, і ня буду асаромлены ў надзеі маёй.
117 Умацуй мяне, і буду збаўлены, і буду ўглядацца ў пастановы Твае заўсёды.
118 Ты адапхнуў усіх, якія ўхіляюцца ад пастановаў Тваіх, бо хлусьлівы падман іхні.
119 Быццам жужаль Ты выкідаеш усіх бязбожнікаў зямлі; дзеля гэтага я ўзьлюбіў сьведчаньні Твае.
120 Дрыжыць ад страху перад Табою цела маё, і судоў Тваіх я баюся.
121 Я чыніў суд і праведнасьць; не аддай мяне прыгнятальнікам маім!
122 Заступіся за слугу Твайго на дабро [яму], каб не прыгняталі мяне свавольнікі.
123 Зьнемагаюць вочы мае, [выглядаючы] збаўленьне Тваё і слова праведнасьці Тваёй.
124 Учыні са слугою Тваім паводле міласэрнасьці Тваёй, і навучы мяне пастановам Тваім.
125 Я — слуга Твой; дай мне разуменьне, каб пазнаў сьведчаньні Твае.
126 Час дзейнічаць для ГОСПАДА, [бо] яны парушылі Закон Твой.
127 Дзеля гэтага я люблю прыказаньні Твае больш, чым золата, золата найчысьцейшае.
128 Дзеля гэтага ўсе загады Твае, усе лічу слушнымі, кожную сьцежку хлусьні ненавіджу.
129 Цудоўныя сьведчаньні Твае, дзеля гэтага душа мая пільнуецца іх.
130 Адкрыцьцё словаў Тваіх асьвятляе, дае разуменьне неразумным.
131 Расчыняю я вусны мае і ўздыхаю, бо прагну прыказаньняў Тваіх.
132 Павярніся да мяне і зьлітуйся нада мною, паводле суду [Твайго] для тых, што любяць імя Тваё.
133 Стопы мае ўмацуй Ты ў слове Тваім і ня дай беззаконьню авалодаць мною.
134 Выбаў мяне ад крыўды чалавека, і буду захоўваць загады Твае.
135 Аблічча Тваё няхай сьвеціць над слугою Тваім, і навучы мяне пастановам Тваім.
136 Струмяні водаў цякуць з вачэй маіх, бо [людзі] не захоўваюць Закон Твой.
137 Ты праведны, ГОСПАДЗЕ, і справядлівыя суды Твае.
138 Ты загадаў [чыніць] праведнасьць, сьведчаньні Твае і вернасьць вялікую.
139 Зьядае мяне руплівасьць мая, бо забыліся на словы Твае прыгнятальнікі мае.
140 Слова Тваё вельмі чыстае, і слуга Твой узьлюбіў яго.
141 Малы я і пагарджаны, але загадаў Тваіх я не забываюся.
142 Праведнасьць Твая — праведнасьць на вякі, і Закон Твой — праўда.
143 Прыгнёт і гора знайшлі мяне; прыказаньні Твае — пацеха мая.
144 Праведнасьць сьведчаньняў Тваіх — на вякі; дай мне разуменьне, і буду жыць.
145 З усяго сэрца я клічу; адкажы мне, ГОСПАДЗЕ, каб я пільнаваўся пастановаў Тваіх.
146 Я клічу Цябе, збаў мяне, і буду захоўваць сьведчаньні Твае!
147 Я апярэджваю сьвітаньне і галашу, на слова Тваё, на слова Тваё спадзяюся.
148 Вочы мае апярэджваюць варту [начную], каб мне разважаць пра слова Тваё.
149 Голас мой пачуй паводле міласэрнасьці Тваёй, ГОСПАДЗЕ, паводле суду Твайго ажыві мяне.
150 Набліжаюцца [да мяне] тыя, што імкнуцца да брыдоты; яны ад Закону Твайго адступіліся.
151 Але блізка Ты, ГОСПАДЗЕ, і ўсе прыказаньні Твае — праўда.
152 Здаўна я ведаю сьведчаньні Твае, што Ты на вякі заснаваў іх.
153 Глянь на нядолю маю і выратуй мяне, бо я пра Закон Твой не забываўся.
154 Барані мяне ў справе маёй і выбаў мяне, паводле слова Твайго ажыві мяне.
155 Далёка ад бязбожнікаў збаўленьне, бо яны не шукалі пастановаў Тваіх.
156 Літасьць Твая вялікая, ГОСПАДЗЕ; паводле суду Твайго ажыві мяне.
157 Шмат тых, што перасьледуюць мяне і прыгнятаюць мяне; але ад сьведчаньняў Тваіх я не ўхіляўся.
158 Я бачыў адступнікаў і брыдзіўся тымі, якія не захоўвалі слова Твайго.
159 Глянь, ГОСПАДЗЕ, як я люблю загады Твае; паводле міласэрнасьці Тваёй ажыві мяне.

160 Аснова слова Твайго — праўда, і на вякі кожны прысуд праведнасьці Тваёй.
161 Князі перасьледуюць мяне без прычыны, але слова Твайго баіцца сэрца маё.
162 Я радуюся са слова Твайго як той, хто знайшоў вялікі прыбытак.
163 Хлусьню ненавіджу і брыджуся ёю, Закон Твой люблю.
164 Сямікротна ў дзень я хвалю Цябе за прысуды праведнасьці Тваёй.
165 Вялікі супакой Ты даеш тым, якія любяць Закон Твой, і яны не спатыкнуцца.
166 Я ўзіраюся на збаўленьне Тваё, ГОСПАДЗЕ, і выконваю прыказаньні Твае.
167 Захоўвала душа мая сьведчаньні Твае, і я моцна ўзьлюбіў іх.
168 Я захоўваю загады Твае і сьведчаньні Твае, бо ўсе шляхі мае перад Табою.
169 Няхай дойдзе галашэньне маё да аблічча Твайго, ГОСПАДЗЕ! Паводле слова Твайго дай мне разуменьне.
170 Няхай прыйдзе маленьне маё перад аблічча Тваё! Паводле слова Твайго выратуй мяне!
171 Вусны мае будуць апавядаць хвалу, бо Ты вучыш мяне пастановам Тваім.
172 Язык мой будзе адказваць пра слова Тваё, бо ўсе прыказаньні Твае праведныя.
173 Няхай станецца рука Твая дапамогай маёй, бо я выбраў загады Твае.
174 Я прагну збаўленьня Твайго, ГОСПАДЗЕ, і Закон Твой — пацеха мая.
175 Няхай жыве душа мая, каб хваліць Цябе, і суды Твае няхай дапамогуць мне.
176 Я заблукаў як авечка, што згубілася, адшукай Ты слугу Твайго, бо прыказаньняў Тваіх я не забываўся.

Пс 120

1 Сьпеў узыходжаньня. Да ГОСПАДА я клікаў у бядзе маёй, і Ён адказаў мне.
2 ГОСПАДЗЕ, вызваль душу маю ад вуснаў хлусьлівых, ад языка здрадлівага.
3 Што дасьць табе і якую карысьць прынясе язык здрадлівы?
4 Вострыя стрэлы волата і вугольле ядлоўцавае.
5 Гора мне, што я жыву ў Мэшэха, што я пасяліўся каля намётаў Кедару!
6 Вельмі доўга душа мая жыла сярод тых, што ненавідзяць супакой.
7 Я — [сам] супакой; але, як толькі прамоўлю, яны [пачынаюць] вайну.

Пс 121

1 Сьпеў узыходжаньня. Узьнімаю я вочы мае да гораў, адкуль прыйдзе да мяне дапамога.
2 Дапамога мая ад ГОСПАДА, Які стварыў неба і зямлю.
3 Ён ня дасьць пахіснуцца назе тваёй, не задрэмле Той, Які захоўвае цябе.
4 Сапраўды, не задрэмле і ня будзе спаць Той, Які захоўвае Ізраіля.
5 ГОСПАД — Той, Які захоўвае цябе, ГОСПАД — цень твой праваруч цябе.
6 Удзень сонца ня ўдарыць цябе, ані месяц уначы.
7 ГОСПАД будзе захоўваць цябе ад усякага зла, будзе душу тваю Ён захоўваць.
8 ГОСПАД будзе захоўваць выхад твой і ўваход твой ад цяпер і на вякі.

Пс 122

1 Сьпеў узыходжаньня. Давіда. Узрадаваўся я, калі мне сказалі: «Хадзем у Дом ГОСПАДА!»
2 Вось, ногі нашыя стаяць у брамах тваіх, Ерусаліме!
3 Ерусаліме! Ты пабудаваны, як горад, які злучаны разам,
4 куды ўваходзяць калены, калены ГОСПАДА, як сьведчаньне для Ізраіля, каб славіць імя ГОСПАДА,
5 бо там стаяць пасады судовыя, пасады дому Давіда.
6 Прасіце пра супакой для Ерусаліму! Няхай маюць дабрадзенства тыя, якія любяць цябе.
7 Супакой няхай будзе ў мурах тваіх, дабрабыт — у палацах тваіх.
8 Дзеля братоў маіх і бліжніх маіх кажу цяпер: «Супакой табе!»
9 Дзеля Дому ГОСПАДА, Бога нашага, буду шукаць дабра для цябе.

Пс 123

1 Сьпеў узыходжаньня. Узьнімаю я вочы мае да Цябе, Які жывеш у нябёсах.
2 Сапраўды, як вочы слугаў [глядзяць] на руку паноў іхніх, як вочы служкі — на руку гаспадыні
яе, так і вочы нашыя — на ГОСПАДА, Бога нашага, аж пакуль ня зьлітуецца над намі.
3 Зьлітуйся над намі, ГОСПАДЗЕ, зьлітуйся, бо мы вельмі насычаныя пагардай!
4 Вельмі моцна насычана душа нашая кпінамі ганарыстых і пагардай фанабэрыстых.

Пс 124

1 Сьпеў узыходжаньня. Давіда. Калі б не было з намі ГОСПАДА, — скажы, прашу, Ізраіль, —
2 калі б не было з намі ГОСПАДА, калі паўстаў супраць нас чалавек,
3 тады яны б нас жывымі праглынулі, калі гнеў іхні распаліўся на нас,
4 тады б воды нас затапілі, струмень заліў бы душы нашыя,
5 тады б воды бурлівыя залілі б душы нашыя.
6 Дабраслаўлёны ГОСПАД, Які не аддаў нас зубам іхнім, як здабычу.
7 Душа наша ўцякла, быццам птушка з сіла птушкалова; сіло парванае, і мы ўцяклі!
8 Дапамога нашая — у імені ГОСПАДА, Які стварыў неба і зямлю.

Пс 125

1 Сьпеў узыходжаньня. Тыя, што спадзяюцца на ГОСПАДА, [яны] як гара Сыён, якая не
пахісьнецца і будзе на вякі.
2 Горы вакол Ерусаліму, а ГОСПАД — вакол народу Свайго ад сёньня і на вякі.
3 Бо кій бязбожнікаў не застанецца над лёсам праведнікаў, каб не цягнулі праведнікі рук сваіх
да беззаконьня.
4 Рабі, ГОСПАДЗЕ, добрае добрым і тым, хто шчыры ў сэрцы сваім.
5 Але тых, што зыходзяць на сьцежкі крывыя свае, няхай выганіць ГОСПАД разам са
злачынцамі. Супакой над Ізраілем!

Пс 126

1 Сьпеў узыходжаньня. Калі ГОСПАД вярнуў палонных Сыёну, мы былі як у сьне.
2 Былі тады вусны нашыя поўныя сьмеху, і язык наш — сьпяваньня. Казалі тады між паганамі:
«Вялікае ГОСПАД зімі ўчыніў!»
3 Вялікае ГОСПАД з намі ўчыніў, і мы былі радасныя.
4 Вярні, ГОСПАДЗЕ, нашых палонных, як ручаі на [зямлю] паўднёвую.
5 Той, хто ў сьлёзах сеяў, жаць будзе са сьпяваньнем.
6 Тыя, што несьлі насеньне на пасеў, ішлі плачучы, але, вяртаючыся, вернуцца са сьпяваньнем,
снапы свае несучы.

Пс 127

1 Сьпеў узыходжаньня. Салямона. Калі ГОСПАД не збудуе дом, надарэмна цяжка працуюць
будаўнікі; калі ГОСПАД не захоўвае горад, надарэмна чуваюць вартаўнікі.
2 Надарэмна для вас рана ўставаць, позна сядзець і есьці хлеб у смутку, бо Свайму ўлюбёнаму
Ён дае ў сьне.
3 Вось, спадчына ад ГОСПАДА — дзеці, узнагарода Ягоная — плод чэрава.
4 Быццам стрэлы ў руцэ магутнай, гэтак сыны маладыя.
5 Шчасьлівы той чалавек, які напоўніў імі сагайдак свой. Ня будуць яны асаромленыя, калі з
ворагамі ў браме будуць гаварыць.

Пс 128

1 Сьпеў узыходжаньня. Шчасьлівы кожны, хто баіцца ГОСПАДА, хто ходзіць шляхамі Ягонымі.
2 Ты будзеш працу рук тваіх есьці, ты шчасьлівы, і добра табе!
3 Жонка твая ў доме тваім будзе плодная, быццам лаза вінаградная; сыны твае — як галіны
аліўкавыя, наўкола стала твайго.

4 Вось, гэтак будзе дабраслаўлёны чалавек, які баіцца ГОСПАДА.
5 І дабраславіць цябе ГОСПАД з Сыёну, і ты будзеш бачыць дабрабыт Ерусаліму ў-ва ўсе дні
жыцьця твайго,
6 і будзеш бачыць сыноў ад сыноў тваіх. Супакой над Ізраілем!

Пс 129

1 Сьпеў узыходжаньня. Шмат уціскалі мяне з маладосьці маёй, — няхай скажа Ізраіль, —
2 шмат уціскалі мяне з маладосьці маёй, але мяне не перамаглі.
3 На хрыбце маім аралі аратыя, праганяючы доўгія барозны свае.
4 ГОСПАД праведны, Ён расьсек вяроўкі бязбожнікаў.
5 Няхай будуць асаромленыя і адступяцца назад усе, што ненавідзяць Сыён!
6 Няхай будуць яны, як трава на даху, якая раней, чым вырвуць яе, засыхае,
7 і жнец не напоўніць ёю рукі сваёй, і вязальнік снапоў — жменяў сваіх.
8 І ня скажа той, што міма праходзіць: «Дабраслаўленьне ГОСПАДА няхай будзе над вамі!
Дабраслаўляем вас імем ГОСПАДА!»

Пс 130

1 Сьпеў узыходжаньня. З глыбіні я клічу Цябе, ГОСПАДЗЕ!
2 Госпадзе, пачуй голас мой! Няхай вушы Твае зважаюць на голас маленьня майго!
3 Калі Ты будзеш памятаць пра беззаконьні, ГОСПАДЗЕ, Госпадзе мой, хто ўстаіць?
4 Бо ў Цябе прабачэньне, каб мелі страх [перад Табою].
5 Спадзяюся на ГОСПАДА, спадзяецца душа мая, і ў слове Ягоным маю спадзяваньне.
6 Душа мая [чакае на] Госпада больш, чым стораж раніцы, чым стораж раніцы.
7 Спадзявайся, Ізраілю, на ГОСПАДА, бо ў ГОСПАДА міласэрнасьць і шчодрасьць збаўленьня,
8 і Ён выбавіць Ізраіль ад усіх беззаконьняў ягоных.

Пс 131

1 Сьпеў узыходжаньня. Давіда. ГОСПАДЗЕ, не вывышалася сэрца маё, і ня ўзносіліся вочы мае,
і не хадзіў я за рэчамі занадта вялікімі і занадта для мяне недасяжнымі,
2 але я ўсьцішаў і супакойваў душу маю, як дзіця, што аднятае ад маці сваёй. Як дзіця, аднятае
[ад маці], душа мая ў-ва мне.
3 Спадзявайся, Ізраіль, на ГОСПАДА, ад цяпер і на вякі!

Пс 132

1 Сьпеў узыходжаньня. Узгадай, ГОСПАДЗЕ, пра Давіда і ўсе беды ягоныя,
2 як ён прысягаў ГОСПАДУ, даваў абяцаньне Моцнаму Якуба:
3 «Не ўвайду ў намёт дому майго, не ўзыйду на пасьцель ложка майго,
4 ня дам вачам маім сну і павекам маім дрымоты,
5 пакуль не знайду месца для ГОСПАДА, сялібы для Моцнага Якуба!»
6 Вось, мы чулі пра яго ў Эфраце, знайшлі яго на палях Яару.
7 Хадзем у сялібу Ягоную, паклонімся перад падножжам стопаў Ягоных.
8 Паўстань, ГОСПАДЗЕ, у месца супачынку Твайго, Ты і каўчэг моцы Тваёй!
9 Сьвятары Твае няхай апрануцца ў праведнасьць, і багабойныя Твае няхай радуюцца!
10 Дзеля Давіда, слугі Твайго, не адварочвай аблічча ад памазанца Твайго!
11 Прысягаў ГОСПАД Давіду праўду і не адступіцца ад яе: «Таго, [хто ёсьць] плод улоньня
твайго, Я пасаджу на пасадзе тваім.
12 І калі сыны твае будуць захоўваць запавет Мой і сьведчаньні Мае, якім Я буду навучаць іх,
таксама сыны іхнія будуць вечна сядзець на пасадзе тваім».
13 Бо ГОСПАД выбраў Сыён, пажадаў, [каб быў] сялібай для Яго, [кажучы]:
14 «Вось месца супачынку Майго вечна. Тут буду жыць, бо яго ўпадабаў.
15 Дабраслаўляючы, дабраслаўлю здабытак ягоны, убогіх ягоных насычу хлебам.

16 І сьвятароў ягоных апрану ў збаўленьне, і багабойныя ягоныя, радуючыся, радавацца будуць.
17 Там Я ўзрашчу рог Давіду, там пастаўлю сьветач памазанцу Майму.
18 Ворагаў ягоных апрану ў ганьбу, а над ім расквітнее дыядэма».

Пс 133

1 Сьпеў узыходжаньня. Давіда. О, як гэта добра і цудоўна, калі браты ў згодзе жывуць!
2 Гэта быццам найлепшы алей на галаве, які сьцякае на бараду, на бараду Аарона, які сьцякае на край шаты ягонай,
3 нібы раса Гермону, якая зыходзіць на горы Сыёнскія, бо там ГОСПАД зьяўляе дабраслаўленьне і жыцьцё на вякі.

Пс 134

1 Сьпеў узыходжаньня. О, дабраслаўляйце ГОСПАДА, усе слугі ГОСПАДА, якія начамі стаіцё ў Доме ГОСПАДА!
2 Узьнімеце рукі вашыя да сьвятыні і дабраслаўляйце ГОСПАДА!
3 З Сыёну няхай дабраславіць цябе ГОСПАД, Які стварыў неба і зямлю!

Пс 135

1 Альлелюя! Хвалеце імя ГОСПАДА, хвалеце, слугі ГОСПАДА,
2 якія стаіцё ў Доме ГОСПАДА, у панадворках Дому Бога нашага!
3 Хвалеце ГОСПАДА, бо добры ГОСПАД; выслаўляйце імя Ягонае, бо яно цудоўнае.
4 Бо Якуба выбраў для Сябе ГОСПАД, Ізраіля — на ўласнасьць Сабе.
5 Бо ведаю я, што ГОСПАД вялікі, і Госпад наш — па-над усімі багамі.
6 Усё, што даспадобы ГОСПАДУ, робіць Ён у небе і на зямлі, у моры і ў-ва ўсіх бяздоньнях.
7 Ён уздымае хмары ад краю зямлі, робіць маланкі і дождж, выводзіць вецер са скарбніцы Сваёй.
8 Ён пабіў першародных у Эгіпце, ад чалавека і да скаціны.
9 Ён паслаў знакі і цуды пасярод цябе, Эгіпце, над фараонам і ўсімі слугамі ягонымі.
10 Ён пабіў шматлікія народы і забіў валадароў магутных:
11 Сыгона, валадара Амарэйскага, і Ога, валадара Башану, і ўсе валадарствы Ханаану.
12 І аддаў зямлю іхнюю ў спадчыну, у спадчыну Ізраілю, народу Свайму.
13 ГОСПАДЗЕ, імя Тваё на вякі! ГОСПАДЗЕ, памяць Твая з пакаленьня ў пакаленьне!
14 Бо ГОСПАД будзе судзіць народ Свой і пашкадуе слугаў Сваіх.
15 Ідалы народаў — срэбра і золата, творы рук чалавечых.
16 Маюць вусны, і не гавораць, маюць вочы, і ня бачаць;
17 маюць вушы, і ня чуюць, і духу няма ў вуснах іхніх.
18 Падобныя да іх будуць тыя, што робяць іх, усе, хто на іх спадзяецца.
19 Доме Ізраіля, дабраслаўляйце ГОСПАДА! Доме Аарона, дабраслаўляйце ГОСПАДА!
20 Доме Левія, дабраслаўляйце ГОСПАДА! Вы, што баіцёся ГОСПАДА, дабраслаўляйце ГОСПАДА!
21 Дабраслаўлёны ГОСПАД з Сыёну, Які жыве ў Ерусаліме! Альлелюя!

Пс 136

1 Слаўце ГОСПАДА, бо Ён добры, бо на вякі міласэрнасьць Яго!
2 Слаўце Бога багоў, бо на вякі міласэрнасьць Яго!
3 Слаўце Пана паноў, бо на вякі міласэрнасьць Яго!
4 Таго, Які Сам робіць цуды вялікія, бо на вякі міласэрнасьць Яго:
5 Таго, Які неба ўчыніў з разуменьнем, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
6 Таго, Які зямлю расьцягнуў па-над водамі, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
7 Таго, Які ўчыніў сьвяцілы вялікія, бо на вякі міласэрнасьць Яго;

8 сонца, каб кіравала днём, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
9 месяц і зоркі, каб кіравалі ноччу, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
10 Таго, Які пабіў Эгіпет у першародных ягоных, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
11 і вывеў Ізраіля спасярод яго, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
12 рукою дужаю і рамяном узьнятым, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
13 Таго, Які Мора Чырвонае расьсек, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
14 і правёў Ізраіля пасярод яго, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
15 і кінуў фараона і войска ягонае ў Мора Чырвонае, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
16 Таго, Які вёў народ Свой праз пустыню, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
17 Таго, Які пабіў валадароў вялікіх, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
18 і забіў валадароў слаўных, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
19 Сыгона, валадара Амарэйскага, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
20 і Ога, валадара Башану, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
21 і аддаў зямлю іхнюю ў спадчыну, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
22 у спадчыну Ізраілю, слузе Свайму, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
23 Таго, Які ў паніжэньні нашым успомніў пра нас, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
24 і выратаваў нас ад прыгнятальнікаў нашых, бо на вякі міласэрнасьць Яго;
25 Таго, Які дае хлеб усякаму целу, бо на вякі міласэрнасьць Яго.
26 Слаўце Бога нябёсаў, бо на вякі міласэрнасьць Яго!

Пс 137

1 Каля рэк Бабілонскіх сядзелі мы там і плакалі, Сыён успамінаючы.
2 На вербах сярод яго мы павесілі гусьлі нашыя.
3 Бо там тыя, што нас паланілі, жадалі ад нас словаў песьні, і нішчыцелі нашыя — радасьці: «Засьпявайце нам нешта з песьняў Сыёнскіх!»
4 Як жа сьпяваць нам сьпеў ГОСПАДА ў зямлі чужой?
5 Калі я забудуся пра цябе, Ерусаліме, няхай забудзецца пра мяне правіца мая!
6 Няхай язык мой прыліпне да паднябеньня майго, калі я ня буду памятаць пра цябе, калі не ўзьніму Ерусалім па-над найвышэйшую радасьць маю!
7 Прыгадай, ГОСПАДЗЕ, сынам Эдому дзень Ерусаліму, калі яны казалі: «Руйнуйце яго, руйнуйце аж да падвалінаў!»
8 Дачка Бабілону, ты будзеш зруйнаваная! Шчасьлівы той, хто адплаціць табе за тое, што ты нам зрабіла!
9 Шчасьлівы той, хто немаўлятаў тваіх схопіць і паб'е аб скалу.

Пс 138

1 Давіда. Я буду славіць Цябе ўсім сэрцам; перад абліччам багоў буду выслаўляць Цябе.
2 Пакланюся ў сьвятыні сьвятасьці Тваёй і буду славіць імя Тваё за міласэрнасьць Тваю і праўду Тваю, бо Ты ўзьвялічыў па-над усякае імя Тваё слова Тваё.
3 У дзень, калі я клікаў, Ты адказаў мне, і ўзмоцніў сілаю душу маю.
4 Будуць славіць Цябе, ГОСПАДЗЕ, усе валадары зямлі, бо пачуюць словы вуснаў Тваіх.
5 І будуць сьпяваць пра шляхі ГОСПАДА, бо вялікая слава ГОСПАДА.
6 Бо ўзвышаны ГОСПАД, але бачыць пакорнага і ганарлівага пазнае здалёк.
7 Калі буду хадзіць сярод турботаў, Ты ажывіш мяне, супраць гневу ворагаў маіх Ты выцягнеш руку Тваю, і мяне вызваліць правіца Твая.
8 ГОСПАД выканае [справу маю] для мяне. ГОСПАДЗЕ, міласэрнасьць Твая на вякі! Не пакінь твораў рук Тваіх! Альлелюя!

Пс 139

1 Кіраўніку хору. Давіда. Псальм. ГОСПАДЗЕ, Ты дасьледаваў мяне і ведаеш [мяне].
2 Ты ведаеш, калі я сядаю і калі я ўстаю; разумееш думку маю здалёк.

3 Сьцежку маю і ляжаньне маё Ты спазнаў, і ўсе шляхі мае Табе вядомыя.
4 Бо няма яшчэ словаў на языку маім, а Ты, ГОСПАДЗЕ, ведаеш усё.
5 Ззаду і сьпераду Ты абняў мяне і паклаў на мяне руку Тваю.
6 Надзвычай дзівоснае веданьне, перавышае мяне, не магу яго сьцяміць!
7 Куды мне ісьці ад Духа Твайго і ад аблічча Твайго куды ўцячы?
8 Калі б я ўзыйшоў на неба, Ты там; калі б паслаў сабе [ложак] у пекле, — вось, [і там] Ты!
9 Калі б я ўзяў крылы сьвітаньня, калі б пасяліўся на канцы мора,
10 там таксама рука Твая вадзіла б мяне, і трымала б мяне правіца Твая.
11 Калі б я сказаў: «Няхай цемра пакрые мяне, і ноччу няхай станецца сьвятло вакол мяне»,
12 дык і цемра ня будзе цёмнай для Цябе, і ноч заясьнее, як дзень; цемра, як сьвятло.
13 Бо Ты стварыў ныркі мае, выткаў мяне ва ўлоньні маці маёй.
14 Слаўлю Цябе, бо я захапляльна і дзівосна збудаваны; цудоўныя справы Твае, і душа мая ведае [гэта] добра.
15 Не былі схаваныя косткі мае перад Табою, калі я кшталтаваўся пад заслонай, быў вытканы ў глыбінях зямлі.
16 Зародак мой бачылі вочы Твае; і ў кнізе Тваёй запісаны ўсе дні, што былі вызначаны, калі яшчэ ніводнага з іх не было.
17 Якія каштоўныя для мяне думкі Твае, Божа, якая вялікая безьліч іх!
18 Лічу іх, але іх больш, чым пяску. Я буджуся, і я ўсьцяж з Табою.
19 Калі б Ты, Божа, забіў бязбожніка, тады людзі крывавыя адыйдуць ад мяне.
20 Яны гавораць супраць Цябе зламыснае; дарэмна робяць сябе ворагамі Тваімі.
21 Ці ж ня мушу я ненавідзець тых, што ненавідзяць Цябе, ГОСПАДЗЕ, і брыдзіцца тымі, што супраць Цябе паўстаюць?
22 Нянавісьцю поўнай я іх ненавіджу, яны сталіся ворагамі для мяне.
23 Дасьледуй мяне, Божа, і спазнай сэрца маё, выспрабуй мяне і спазнай думкі мае!
24 І паглядзі, ці не на гаротным я шляху, і шляхам вечнасьці вядзі мяне.

Пс 140

1 Кіраўніку хору. Псальм Давіда.
2 Ратуй мяне, ГОСПАДЗЕ, ад чалавека ліхога, ад чалавека злачыннага захоўвай мяне!
3 Яны задумляюць ліхое ў сэрцы сваім, кожны дзень узьнімаюць вайну,
4 навастрылі язык свой, як зьмеі, атрута зьмяіная ў вуснах іхніх. (Сэлях)
5 Захавай мяне, ГОСПАДЗЕ, ад рук бязбожніка! Захоўвай мяне ад чалавека злачыннага, ад тых, што мяркуюць пахіснуць стопы мае.
6 Пыхліўцы таемна [наставілі] пастку для мяне і петлі, расьцягнулі сеці пры сьцежцы, паставілі сіло для мяне. (Сэлях)
7 Сказаў я да ГОСПАДА: «Ты — мой Бог!» Прыхілі вуха, ГОСПАДЗЕ, на голас маленьня майго!
8 ГОСПАДЗЕ, Госпадзе, моц збаўленьня майго, Ты засланяеш галаву маю ў дзень бітвы.
9 Ня дай таго, ГОСПАДЗЕ, што жадае бязбожнік, намерам ягоным ня дай споўніцца, каб не ўзьнімаліся яны! (Сэлях)
10 Няхай галовы тых, што мяне абступілі, пакрыюцца ліхоцьцем вуснаў іхніх!
11 Няхай пасыплецца на іх вугольле! У агонь няхай кіне Ён іх, у дол глыбокі, каб ім не паўстаць!
12 Чалавек з языком [ліхім] на зямлі ня ўстоіць; на чалавека злачыннага ліхоцьце цікаваць будзе, каб загубіць яго.
13 Ведаю я, што ГОСПАД выступіць у справе прыгнечанага, [дасьць] суд убогаму.
14 І будуць праведнікі славіць імя Тваё, правыя будуць жыць перад абліччам Тваім!

Пс 141

1 Псальм Давіда. ГОСПАДЗЕ, клічу Цябе! Пасьпяшайся да мяне! Прыхілі вуха на голас мой, калі клічу да Цябе!

2 Няхай будзе малітва мая як кадзіла перад абліччам Тваім, а ўзьніманьне рук маіх — як дар
вечаровы!
3 Пастаў, ГОСПАДЗЕ, варту вуснам маім, захоўвай дзьверы губаў маіх!
4 Ня дай прыхіліцца сэрцу майму да словаў ліхіх, да чыненьня справаў бязбожных з людзьмі
злачыннымі, і няхай ня буду я есьці ласункі іхнія.
5 Няхай б'е мяне праведнік, [бо гэта] міласэрнасьць; няхай карае мяне, [бо гэта] алей для
галавы, які не пашкодзіць галаве маёй; бо малітва мая — супраць ліхоты іхняй.
6 Няхай будуць скінутыя ў рукі Скалы судзьдзі іхнія, і пачуюць яны словы мае, бо яны
прыемныя.
7 Быццам нехта трушчыць і сячэ [дровы] на зямлі, так сыплюцца косткі нашыя ў пашчу пекла.
8 Але да Цябе, ГОСПАДЗЕ, Госпадзе мой, вочы мае; у Табе я маю надзею, не зруйнуй Ты душы
маёй.
9 Захавай Ты мяне ад пасткі, што яны наставілі на мяне, ад сіла, [што наставілі] злачынцы.
10 Няхай патрапяць усе разам бязбожнікі ў сеці свае, а я абміну іх.

Пс 142

1 Навучаньне Давіда, калі ён быў у пячоры. Малітва.
2 Голасам маім я крычу да ГОСПАДА, голасам маім прашу ГОСПАДА пра літасьць.
3 Перад абліччам Ягоным я выліваю смутак мой, пра трывогу маю перад абліччам Ягоным
апавядаю.
4 Калі зьнемагае ў-ва мне дух мой, Ты ведаеш сьцежку маю. На дарозе, якой я хаджу, яны
таемна [наставілі] сіло на мяне.
5 Гляджу я ўправа, і бачу, што няма нікога, хто б ведаў мяне; загінуў прытулак мой, ніхто не
шукае душы маёй.
6 Я крычу да Цябе, ГОСПАДЗЕ, кажучы: «Ты — прыстанішча маё, Ты — частка мая ў зямлі
жывых!»
7 Зваж на галашэньне маё, бо вельмі я зьнямогся; ратуй Ты мяне ад тых, што перасьледуюць
мяне, бо яны дужэйшыя за мяне.
8 Вызваль з вязьніцы душу маю, каб я славіў імя Тваё. Праведнікі абступаюць мяне навакол,
бо Ты робіш дабро для мяне.

Пс 143

1 Псальм Давіда. ГОСПАДЗЕ, пачуй малітву маю, прыхілі вуха на маленьне маё, паводле
праўды Тваёй адкажы мне, паводле праведнасьці Тваёй.
2 І не ўваходзь у суд са слугою Тваім, бо ня будзе праведны перад абліччам Тваім ніхто з жывых.
3 Бо перасьледуе вораг душу маю, скрышыў да зямлі жыцьцё маё, змусіў жыць мяне ў месцы
цёмным, быццам тых, што памерлі даўно.
4 І зьнямогся ў-ва мне дух мой, замерла ў нутры маім сэрца маё.
5 Я ўзгадваю дні старадаўнія, разважаю пра ўсе дзеяньні Твае, пра ўчынкі рук Тваіх думаю.
6 Выцягваю рукі мае да Цябе; душа мая [прагне] Цябе, як зямля бязводная. (Сэлях)
7 Пасьпяшайся, адкажы мне, ГОСПАДЗЕ! Чэзьне дух мой! Не хавай жа аблічча Твайго ад мяне,
каб ня стаўся я падобным да таго, хто зыходзіць у магілу.
8 Дай мне раніцаю чуць пра міласэрнасьць Тваю, бо я на Цябе спадзяюся. Дай мне ведаць шлях,
якім мне ісьці, бо да Цябе я ўзьнімаю душу маю.
9 Ратуй мяне ад ворагаў маіх, ГОСПАДЗЕ, у Цябе я хаваюся.
10 Навучы мяне рабіць тое, што даспадобы Табе, бо Ты — Бог мой. Няхай добры Твой дух вядзе
мяне да зямлі роўнай.
11 ГОСПАДЗЕ, дзеля імя Твайго ажыві мяне! У праведнасьці Тваёй вывядзі з уціску душу маю!
12 І ў міласэрнасьці Тваёй вынішчы ворагаў маіх, і зьнішчы ўсіх, што ўціскаюць душу маю, бо
я — слуга Твой!

Пс 144

1 Давіда. Дабраслаўлёны ГОСПАД, скала мая, Які навучае рукі мае барацьбе, і пальцы мае —
змаганьню.
2 Міласэрнасьць для мяне і замчышча маё, умацаваны замак мой і Збаўца для мяне, шчыт мой,
Той, у Якім маю надзею, Ён народ мой падпарадкоўвае мне!
3 ГОСПАДЗЕ, што ёсьць чалавек, што Ты ведаеш яго, і сын чалавечы, што Ты думаеш пра яго?
4 Чалавек падобны да марнасьці; дні ягоныя — быццам цень, што мінае.
5 ГОСПАДЗЕ, нахілі неба Тваё і зыйдзі, дакраніся да гор, і яны запалаюць!
6 Блісьні маланкай і расьцяруш іх, пусьці стрэлы Твае і прагані іх!
7 Выцягні з вышыні руку Тваю, вызвалі мяне і выратуй мяне з водаў вялікіх, з рукі сыноў
чужынскіх,
8 вусны якіх гавораць марнае, а правіца іхняя — правіца хлусьні.
9 Божа, я новы сьпеў буду сьпяваць для Цябе, на псалтыры дзесяціструнным буду граць Табе,
10 бо Ты даеш выратаваньне валадару, і выбаўляеш Давіда, слугу Твайго, ад мяча злыдня!
11 Выбаў мяне і выратуй мяне ад рукі сыноў чужынскіх, вусны якіх гавораць марнае, а правіца
іхняя — правіца хлусьні.
12 Няхай будуць сыны нашыя, быццам саджанцы, якія разрастаюцца ў маладосьці сваёй; дочкі
нашыя — быццам слупы вуглавыя, якія высечаны паводле ўзору сьвятыні.
13 Сьпіжарні нашыя няхай будуць поўныя, каб задаволіць любыя патрэбы, усялякія патрэбы;
няхай у тысячу разоў памножацца авечкі нашыя на вуліцах нашых.
14 Валы нашыя няхай будуць тлустыя, няхай ня будзе ані вылому, ані страты, ані ляманту на
плошчах нашых!
15 Шчасьлівы той народ, у якога гэтак дзеецца! Шчасьлівы той народ, у якога ГОСПАД ёсьць
Бог ягоны!

Пс 145

1 Хвала Давіда. Буду вывышаць Цябе, Божа мой і Валадару, і дабраслаўляць імя Тваё на вякі і
вечна!
2 Штодня буду дабраслаўляць Цябе і буду хваліць імя Тваё на вякі і вечна.
3 Вялікі ГОСПАД і годны хвалы, і веліч Ягоная недасьледная.
4 Пакаленьне пакаленьню будзе хваліць творы Твае і пра магутнасьць Тваю будзе апавядаць.
5 Пра слаўную годнасьць велічнасьці Тваёй і пра цудоўныя дзеі Твае буду разважаць.
6 Пра магутнасьць [дзеяньняў] страшных Тваіх няхай гавораць яны; а я пра веліч Тваю буду
абвяшчаць.
7 Успаміны пра вялікую добрасьць Тваю яны будуць пераказваць і весяліцца дзеля
праведнасьці Тваёй.
8 Літасьцівы і спагадлівы ГОСПАД, павольны да гневу і вельмі міласэрны.
9 Добры ГОСПАД да ўсіх, і літасьць Ягоная — па-над усе справы Ягоныя.
10 Няхай славяць Цябе, ГОСПАДЗЕ, усе творы Твае, і багабойныя Твае няхай дабраслаўляюць
Цябе!
11 Пра славу Валадарства Твайго няхай гавораць яны і пра магутнасьць Тваю расказваюць,
12 каб даведаліся сыны чалавечыя пра магутнасьць Ягоную і пра славу велічнасьці Валадарства
Ягонага.
13 Валадарства Тваё — валадарства на ўсе вякі, і панаваньне Тваё — у-ва ўсіх пакаленьнях.
14 Падтрымлівае ГОСПАД усіх, хто падае, і падымае ўсіх прыгнечаных.
15 Вочы ўсіх на Цябе ўзіраюцца, і Ты ім спажыву даеш у свой час.
16 Ты расчыняеш руку Тваю і насычаеш усё, што жыве, паводле ўпадабаньня.
17 Праведны ГОСПАД на ўсіх шляхах Сваіх і сьвяты ў-ва ўсіх справах Сваіх.
18 ГОСПАД блізкі да ўсіх, што клічуць Яго, да ўсіх, што клічуць Яго ў праўдзе.
19 Ён робіць паводле жаданьня тых, што баяцца Яго, і чуе лямант іхні і выбаўляе іх.
20 ГОСПАД захоўвае ўсіх, што любяць Яго, але ўсіх бязбожных Ён зьнішчыць.

21 Хвалу ГОСПАДУ будуць казаць вусны мае, і ўсякае цела няхай дабраслаўляе сьвятое імя
Ягонае на вякі і вечна.

Пс 146

1 Альлелюя! Хвалі, душа мая, ГОСПАДА!
2 Хваліць буду ГОСПАДА, пакуль жыву; выслаўляць буду Бога майго, пакуль існую.
3 Не спадзявайцеся на магнатаў, на сына чалавечага, у якім няма выратаваньня!
4 Выйдзе дух з яго, і ён вернецца ў зямлю; у той самы дзень зьнікнуць і задумы ягоныя.
5 Шчасьлівы той, у каго Бог Якуба — дапамога, у каго надзея на ГОСПАДА, Бога ягонага,
6 Які стварыў неба і зямлю, мора і ўсё, што ў ім, Які захоўвае праўду на вякі,
7 Які ўчыняе суд для пакрыўджаных, дае хлеба галодным. ГОСПАД разьвязвае зьвязаных,
8 ГОСПАД расплюшчвае [вочы] сьляпых, ГОСПАД падымае прыгнечаных, ГОСПАД любіць
праведных.
9 ГОСПАД захоўвае прыхадняў, дапамагае сіротам і ўдовам, але шлях бязбожнікаў блытае.
10 Валадарыць ГОСПАД на вякі; Бог твой, Сыёне, — з пакаленьня ў пакаленьне! Альлелюя!

Пс 147

1 Хвалеце ГОСПАДА, бо Ён добры; выслаўляйце Бога нашага, бо прыемна гэта. Хвала належыць
Яму!
2 ГОСПАД будуе Ерусалім, зьбірае выгнанцаў Ізраіля.
3 Ён лечыць скрышаных сэрцам і перавязвае раны іхнія.
4 Ён вызначае лік зоркам, кожную імем яе называе.
5 Вялікі Госпад наш і багаты сілай, розум Ягоны меры ня мае.
6 ГОСПАД дапамагае ўцісканым, бязбожнікаў да зямлі паніжае.
7 Адкажыце ГОСПАДУ падзякай, выслаўляйце Бога нашага на гусьлях.
8 Ён закрывае неба хмарамі, рыхтуе для зямлі дождж, узрошчвае траву на гарах,
9 дае скаціне спажыву яе, і груганятам, што крычаць да Яго.
10 Ня ў сіле каня Ён мае ўпадабаньне і ня ногі мужа даспадобы Яму,
11 але даспадобы ГОСПАДУ тыя, што баяцца Яго, што спадзяюцца на міласэрнасьць Ягоную.
12 Слаў ГОСПАДА, Ерусалім, хвалі Бога твайго, Сыёне!
13 Бо Ён умацаваў завалы брамаў тваіх, дабраславіў сыноў тваіх пасярод цябе.
14 Ён дае супакой у межах тваіх, тлустасьцю пшаніцы насычае цябе.
15 Ён спасылае слова Сваё на зямлю, вельмі хутка бяжыць пастанова Ягоная!
16 Ён дае сьнег, быццам воўну, сыпле шэрань, як попел.
17 Ён кідае лёд Свой кавалкамі; перад марозам Ягоным хто можа ўстаяць?
18 Ён пасылае слова Сваё, і растапляецца [ўсё]; Ён павее ветрам Сваім, і воды цякуць.
19 Ён паведаміў слова, слова Сваё Якубу, пастановы Свае і суды Свае — для Ізраіля.
20 Не зрабіў такога ніводнаму народу, і судоў Ягоных не пазналі яны. Альлелюя!

Пс 148

1 Альлелюя! Хвалеце ГОСПАДА з неба, хвалеце Яго на вышынях!
2 Хвалеце Яго, усе анёлы Ягоныя! Хвалеце Яго, усе войскі Ягоныя!
3 Хвалеце Яго, сонца і месяц, хвалеце Яго, усе зоркі ясныя!
4 Хвалеце Яго, нябёсы нябёсаў, і вы, воды, што па-над нябёсамі!
5 Няхай яны хваляць імя ГОСПАДА, бо Ён загадаў, і былі створаныя,
6 і паставіў іх на вякі вечныя; даў ім пастанову, і не пераступяць яе.
7 Хвалеце ГОСПАДА з зямлі, цмокі і ўсе бяздоньні,
8 агонь і град, сьнег і туман, вецер бурны, які дзее паводле слова Ягонага,
9 горы і ўзгоркі ўсе, дрэвы пладовыя і кедры ўсе,
10 зьвяры і ўся скаціна, паўзуны і птаства крылатае,
11 валадары зямныя і ўсе народы, князі і ўсе судзьдзі зямлі,

12 юнакі разам з дзяўчатамі, старыя і маладыя.
13 Няхай яны хваляць імя ГОСПАДА, бо толькі Ягонае імя ўзьвялічанае, слава Ягоная над
зямлёю і небам!
14 Ён узьняў рог народу Свайго. Хвала Яму ад усіх багабойных Ягоных, ад сыноў Ізраіля, ад
народу, блізкага Яму! Альлелюя!

Пс 149

1 Альлелюя! Сьпявайце ГОСПАДУ новы сьпеў; хвала Яму ў царкве багабойных!
2 Весяліся, Ізраілю, у Творцы тваім; радуйцеся, сыны Сыёну, у Валадару вашым!
3 Хвалеце імя Ягонае карагодамі, на бубнах і на гусьлях выслаўляйце Яго!
4 Бо даспадобы ГОСПАДУ народ Ягоны; уцісканым Ён зьявіць збаўленьне.
5 Будуць цешыцца багабойныя ў славе [Ягонай], будуць весяліцца на ложках сваіх.
6 Праслаўленьне Богу няхай будзе ў вуснах іхніх, а меч двусечны — у руцэ іхняй,
7 каб зьдзейсьніць помсту над паганамі, кару над народамі,
8 каб вязаць валадароў іхніх ланцугамі, і шляхту іхнюю — кайданамі жалезнымі,
9 каб учыніць для іх суд, як напісана. Гэткая велічнасьць для ўсіх багабойных Ягоных!
Альлелюя!

Пс 150

1 Альлелюя! Хвалеце Бога ў сьвятыні Ягонай, хвалеце Яго ў прасьцягу моцы Ягонай!
2 Хвалеце Яго за магутнасьць Ягоную; хвалеце Яго дзеля мноства велічы Ягонай!
3 Хвалеце Яго гукам трубаў, хвалеце Яго на псалтыры і гусьлях!
4 Хвалеце Яго з бубнамі і карагодамі; хвалеце Яго на струнах і жалейках!
5 Хвалеце Яго на цымбалах гучных; хвалеце Яго на цымбалах галосных!
6 Усякае дыханьне няхай хваліць ГОСПАДА! Альлелюя!

КНІГА ПРЫПОВЕСЬЦЯЎ

1 Прыповесьці Салямона, сына Давіда, валадара Ізраіля,
2 каб спазнаць мудрасьць і настаўленьне, зразумець словы розуму,
3 каб атрымаць настаўленьні ў разважлівасьці, праведнасьці, судзе і справядлівасьці,
4 каб неразумным даць разумнасьць, юнаку — веды і разважлівасьць.
5 Мудры няхай слухае і павялічвае веды, а разумны няхай прыдбае мудрыя думкі,
6 каб зразумець выслоўе і прыповесьць, словы мудрых і загадкі іхнія.
7 Страх перад ГОСПАДАМ — пачатак веданьня. Неразумныя пагарджаюць мудрасьцю і настаўленьнем.
8 Сыне мой, паслухай перасьцярогаў бацькі твайго і не адкідай настаўленьняў маці тваёй,
9 бо яны — прывабны вянок на галаве тваёй і каштоўныя каралі на шыі тваёй.
10 Сыне мой, калі б цябе намаўлялі грэшнікі, не далучайся да іх.
11 Калі яны скажуць: «Хадзем з намі! Зробім засаду дзеля праліцьця крыві; наставім без прычыны пастку на нявіннага;
12 праглынем іх жыўцом, як пекла, і цалкам, як тых, што зыходзяць у магілу;
13 знойдзем усялякія каштоўнасьці, напоўнім дамы свае здабычаю.
14 Жэрабя сваё кідай разам з намі, няхай адзін мех будзе для нас усіх».
15 Сыне мой, не хадзі з імі, устрымай нагу тваю ад сьцежкі іхняй,
16 бо ногі іхнія бягуць да злачынства і сьпяшаюцца на праліцьцё крыві.
17 Бо надарэмна настаўляецца сетка на вачах усяго птаства.
18 А яны цікуюць на ўласную кроў, робяць засаду супраць душы сваёй.
19 Такія вось сьцежкі кожнага, хто прагне чужога даброцьця; яно забірае душу таго, хто завалодае ім.
20 Мудрасьць гукае на вуліцах, на плошчах узьнімае голас свой,
21 на скрыжаваньнях шумлівых дарог кліча, у брамах гарадзкіх гучаць яе словы:
22 «Дакуль, неразумныя, будзеце любіць неразумнасьць; дакуль, насьмешнікі, будзеце захапляцца насьмешкамі сваімі, а невукі — пагарджаць веданьнем?
23 Зьвярніцеся да настаўленьня майго, і я выльлю на вас духа майго, і абвяшчу вам словы мае.
24 Вось жа я клікала, але вы адмаўляліся, працягвала руку сваю, але ніхто не зьвярнуў увагі.
25 Вы ўзгардзілі радай маёю і адкінулі дакараньні мае.
26 Дык і я буду сьмяяцца з падзеньня вашага, і насьміхацца буду, калі прыйдзе на вас жах.
27 Калі нахлыне жах, як бура, і загуба ваша, быццам віхура, калі прыйдуць на вас трывога і гора,
28 тады будуць клікаць мяне, але я не адкажу, будуць шукаць мяне, і ня знойдуць мяне.
29 Бо яны зьненавідзелі веданьне і ня выбралі для сябе страху перад ГОСПАДАМ,
30 і не пайшлі за парадамі маімі, і ўзгардзілі перасьцярогамі маімі.
31 Дык няхай ядуць яны плады шляху свайго і насыцяцца намерамі сваімі.
32 Бо адступніцтва неразумных заб'е іх, бяздумнасьць дурняў загубіць іх.
33 А хто слухае мяне, будзе жыць бясьпечна, будзе спакойны, не баючыся зла».

Разьдзел 2

1 Сыне мой, калі ты прыймеш словы мае і захаваеш у сябе прыказаньні мае,
2 прыхіляючы вуха тваё да мудрасьці і схіляючы сэрца тваё да разважлівасьці,
3 калі вось клікаць будзеш розум і голас твой уздымеш, заклікаючы развагу,
4 калі шукаць яе будзеш як срэбра, і прагнуць яе будзеш як багацьця,
5 тады зразумееш страх перад ГОСПАДАМ і знойдзеш пазнаньне Бога.
6 Бо ГОСПАД дае мудрасьць, і з вуснаў Ягоных — веданьне і разуменьне.

7 Ён захоўвае цьвярозы розум правым, Ён — шчыт для тых, якія ходзяць беззаганна.
8 Ён пільнуе сьцежкі правасудзьдзя, захоўвае шляхі багабойных Сваіх.
9 Тады зразумееш праведнасьць, суд і справядлівасьць, і кожны шлях добры,
10 калі ўвойдзе мудрасьць у сэрца тваё, і веданьне ўсьцешыць душу тваю.
11 Разважлівасьць будзе пільнаваць цябе, і розум будзе захоўваць цябе,
12 каб выратаваць цябе ад шляху ліхога і ад чалавека, які гаворыць хлусьліва,
13 ад тых, якія пакідаюць шлях просты, каб хадзіць сьцежкамі цемры,
14 якія цешацца, робячы злое, і радуюцца з ліхіх учынкаў,
15 у якіх шляхі крывыя і якія блукаюцца на сьцежках сваіх,
16 каб выратаваць цябе ад чужой жанчыны і ад чужаніцы, што гаворыць лісьліва,
17 якая пакінула сябра маладосьці сваёй і забылася на запавет Бога свайго.
18 Бо дом яе нахіліўся да сьмерці, і шлях ейны — да мёртвых;
19 усе, хто да яе ўваходзяць, назад не вяртаюцца і не знаходзяць сьцежак жыцьця.
20 Дык хадзі ж ты шляхам добрых і трымайся сьцежкі праведнікаў,
21 бо правыя будуць жыць на зямлі, і беззаганныя застануцца на ёй.
22 А бязбожныя будуць вынішчаны з зямлі, ліхадзеі будуць выкарэнены з яе.

Разьдзел 3

1 Сыне мой, не забывайся настаўленьня майго, і няхай сэрца тваё захоўвае прыказаньні мае,
2 бо доўгія дні, гады жыцьця і супакой прынясуць яны табе.
3 Міласэрнасьць і праўда няхай не пакідаюць цябе, абвяжы імі шыю сабе і напішы іх на табліцах сэрца твайго,
4 і знойдзеш ты ласку і спагаднасьць у вачах Бога і людзей.
5 Спадзявайся на ГОСПАДА ўсім сэрцам тваім і не абапірайся на розум твой.
6 Думай пра Яго на ўсіх шляхах тваіх, і Ён выпрастуе сьцежкі твае.
7 Ня будзь мудры ў вачах сваіх, бойся ГОСПАДА і пазьбягай ліхоты.
8 Гэта будзе здароўем для цела твайго і спасіленьнем для костак тваіх.
9 Шануй ГОСПАДА ўсёй маёмасьцю тваёй і пяршынамі ўсіх пладоў тваіх,
10 і напоўняцца гумны твае збожжам, а тоўчні твае перапоўняцца новым віном.
11 Не адкідай, сыне мой, настаўленьня ГОСПАДА, і не ўхіляйся, калі Ён дакарае цябе,
12 бо каго любіць ГОСПАД, таго карае, як бацька, які спагадае сыну.
13 Шчасьлівы чалавек, які знайшоў мудрасьць, і чалавек, які прыдбаў разуменьне.
14 Бо здабыць яе лепш, чым здабыць срэбра, і плады ейныя лепшыя за золата.
15 Яна — каштоўнейшая за пэрліны, і нішто з таго, што ты прагнеш, ня можа параўнацца з ёю.
16 Доўгасьць дзён у правай руцэ яе, а ў левай руцэ — багацьце і слава.
17 Шляхі яе — шляхі прыемныя, і ўсе сьцежкі ейныя — супакой.
18 Яна — дрэва жыцьця для тых, што трымаюцца яе, шчасьлівыя тыя, якія абапіраюцца на яе.
19 ГОСПАД мудрасьцю заснаваў зямлю, нябёсы ўмацаваў розумам.
20 Яго веданьнем расчыніліся бяздоньні і аблокі імгляць расою.
21 Сыне мой, няхай гэта не адыходзіць ад вачэй тваіх, захоўвай разумнасьць і разважнасьць.
22 І яны стануцца жыцьцём для душы тваёй і аздобаю для шыі тваёй.
23 Тады пойдзеш бясьпечна шляхам тваім, і нага твая не пахісьнецца.
24 Калі ляжаш спаць, ня будзеш мець страху, і калі засьнеш, сон твой будзе салодкі.
25 Не спалохаешся раптоўнага страху і загубы бязбожнікаў, калі яна прыйдзе,
26 бо ГОСПАД будзе спадзяваньнем тваім і захавае нагу тваю ад пасткі.
27 Не адмаўляй у дабрадзействе таму, хто патрабуе, калі рука твая мае сілу зрабіць гэта.
28 Не кажы бліжняму твайму: «Ідзі сабе і прыйдзі зноў, заўтра дам табе», калі маеш гэта пры сабе.
29 Не надумляй ліхоцьця супраць бліжняга твайго, калі ён жыве пры табе бясьпечна.

30 Не сварыся з чалавекам без прычыны, калі ён не зрабіў табе нічога благога.
31 Не зайздросьці чалавеку злачыннаму і не выбірай ніводнага са шляхоў ягоных,
32 бо ГОСПАД брыдзіцца крывадушным, а з правымі Ён сябруе.
33 Праклён ад ГОСПАДА на доме бязбожніка, але жытло праведных Ён дабраслаўляе.
34 Ён сьмяецца з насьмешнікаў, а пакорным ласку дае.
35 Мудрыя атрымаюць у спадчыну славу, а бязглуздыя будуць насіць ганьбу.

Разьдзел 4

1 Слухайце, дзеці, настаўленьне бацькі і ўважайце, каб навучыцца розуму,
2 бо я даю вам добрую навуку; не пакідайце закону майго.
3 Бо і я быў сынам у бацькі майго, пешчаны і адзіны ў маці маёй.
4 І ён вучыў мяне, і казаў мне: «Няхай трымаецца сэрца тваё словаў маіх, захоўвай прыказаньні мае і жыві.
5 Набывай мудрасьць, набывай розум, не забывайся і не ўхіляйся ад словаў вуснаў маіх.
6 Не пакідай яе, і яна захавае цябе, любі яе, і яна будзе пільнаваць цябе.
7 Галоўнае — мудрасьць; набывай мудрасьць, і за ўсю маёмасьць тваю набывай розум.
8 Узьвяліч яе, і яна падыме цябе, яна праславіць цябе, калі ты ўхопішся за яе,
9 ускладзе на галаву тваю вянок ласкі, аздобіць цябе каронаю славы».
10 Слухай, сыне мой, і прыймі словы мае, і памножацца гады жыцьця твайго.
11 Я паказваю табе шлях мудрасьці, вяду цябе сьцежкамі праведнасьці.
12 Калі пойдзеш імі, ня будуць блытацца ногі твае, калі пабяжыш, не спатыкнешся.
13 Трымайся настаўленьня, не занядбоўвай, захоўвай яго, бо яно — жыцьцё для цябе.
14 Не ўзыходзь на сьцежку бязбожнікаў і не хадзі па шляху ліхотнікаў,
15 пазьбягай яго і не хадзі па ім, ухіляйся ад яго і абмінай яго,
16 бо не заснуць яны, калі ня ўчыняць благога, і сон іх ня возьме, калі не давядуць каго да падзеньня.
17 Бо ядуць яны хлеб беззаконьня і п’юць віно гвалту.
18 Але сьцежка праведных — як сьвятло зараніцы, што ўзыходзіць і расьце аж да поўнага дня.
19 Шлях бязбожнікаў цёмны, яны ня ведаюць, дзе спатыкнуцца.
20 Сыне мой, зважай на словы мае, прыхілі вуха тваё да прамоваў маіх.
21 Няхай не зыходзяць яны з вачэй тваіх, захоўвай іх у глыбіні сэрца твайго,
22 бо яны — жыцьцё для таго, хто знайшоў іх, і здароўе для ўсяго цела яго.
23 З усёй стараннасьцю захоўвай сэрца тваё, бо з яго крыніца жыцьця.
24 Адкінь ад сябе вусны хлусьлівыя, аддалі ад сябе язык крывадушны.
25 Вочы твае няхай глядзяць проста, а павекі твае няхай скіраваныя будуць перад табою.
26 Абдумай сьцежку для ног тваіх, і ўсе шляхі твае няхай будуць пэўныя.
27 Не зыходзь ані направа, ані налева, аддалі нагу тваю ад ліхоцьця.

Разьдзел 5

1 Сыне мой, зважай на мудрасьць маю, прыхілі вуха тваё да розуму майго,
2 каб меў ты разважлівасьць, і вусны твае захавалі веданьне.
3 Бо вусны распусьніцы ацякаюць мёдам, і паднябеньне яе мякчэйшае за алей,
4 але канец яе горкі, як палын, і востры, як меч двусечны.
5 Ногі ейныя да сьмерці зыходзяць, а стопы ейныя на пекла абапіраюцца.
6 Як яна не разумее сьцежкі жыцьця, дык хістаюцца крокі яе, і ты ня можаш ведаць іх.
7 Дык вось цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і не адыходзьцеся ад словаў вуснаў маіх.
8 Аддалі ад яе шлях твой, і не падыходзь да дзьвярэй дому яе,
9 каб не аддаць годнасьці тваёй іншым і гадоў тваіх — бязьлітаснаму,
10 каб не сыцелі чужынцы з сілы тваёй, і з працы тваёй — у доме чужым.
11 І будзеш ты потым стагнаць, калі будуць зьняможаныя цела тваё і сілы твае.

12 І ты скажаш: «Чаму я зьненавідзеў настаўленьне, і сэрца маё ўзгардзіла дакараньнем.
13 Ня слухаў я голасу настаўнікаў маіх, і не прыхіляў я вуха майго да тых, што вучылі мяне.
14 Ледзь ня трапіў я ў вялікае няшчасьце сярод грамады і народу!»
15 Пі ваду з крыніцы тваёй, тую, што цячэ з калодзежу твайго.
16 Навошта крыніцам тваім разьлівацца на вуліцы, а ручаям цячы па плошчах?
17 Няхай яны служаць толькі табе, а не чужынцам разам з табою.
18 Няхай крыніца твая будзе дабраслаўлёная, і цешся жонкай маладосьці тваёй.
19 Яна — ланя ласкавая і сарна прыгожая, грудзі ейныя няхай напойваюць цябе ў-ва ўсякую часіну, у каханьні яе мей асалоду заўсёды.
20 Навошта табе, сыне мой, захапляцца распусьніцай і абдымаць улоньне чужаніцы?
21 Бо перад вачамі ГОСПАДА шляхі чалавека, Ён ведае ўсе крокі яго.
22 Бязбожніка схопяць ягоныя ўласныя правіны, і ён зьвязаны путамі грахоў сваіх.
23 Ён памрэ без настаўленьня і будзе блукаць дзеля вялікай глупоты сваёй.

Разьдзел 6

1 Сыне мой, калі ты ручаўся за бліжняга твайго і даў руку тваю за чужога,
2 ты спутаў сябе словамі вуснаў тваіх, і ты злоўлены словамі вуснаў тваіх.
3 Дык зрабі, што раю, сыне мой, і вызвалі сябе, бо ты трапіў у рукі бліжняга твайго: бяжы, упадзі да ног і ўпрошвай бліжняга твайго,
4 не давай сну вачам тваім і спачынку павекам тваім,
5 вырывайся, як сарна з рукі і як птушка з рукі птушкалова.
6 Ідзі да мураша, гультаю, і паглядзі на шляхі ягоныя, і стань ся мудрым.
7 Няма ў яго начальніка, ані наглядчыка, ані кіраўніка,
8 але ён летам загатаўляе хлеб сабе і зьбірае ежу сваю ў жніво.
9 Як доўга, гультаю, будзеш спаць? Калі ты ўстанеш ад сну свайго?
10 Крыху пасьпіш, крыху падрэміш, крыху, склаўшы рукі, паляжыш,
11 і прыйдзе, як валацуга, беднасьць твая, і нястача твая, як чалавек узброены.
12 Чалавек нягодны, чалавек злачынны ходзіць з хлусьлівымі вуснамі,
13 лыпае вачыма сваімі, круціць нагамі сваімі, пальцамі сваімі знакі дае,
14 хавае ліхоту ў сэрцы сваім, увесь час прыдумляе благое, сваркі расьсявае.
15 Таму зьнянацку прыйдзе на яго загуба, раптоўна будзе зьнішчаны, і ня будзе яму аздараўленьня.
16 Вось шэсьць, якіх ненавідзіць ГОСПАД, і сем, якія агідныя для душы Яго:
17 вочы пыхлівыя, язык хлусьлівы, рукі, што праліваюць кроў нявінную,
18 сэрца, якое задумвае намеры зласьлівыя, ногі, што хутка бягуць на благое,
19 сьведка фальшывы, які дыхае няпраўдай, і той, хто сее нязгоду між братамі.
20 Сыне мой, захавай прыказаньні бацькі твайго і не пакідай закон маці тваёй,
21 навяжы іх назаўсёды на сэрцы тваім і абвяжы імі шыю тваю.
22 Калі пойдзеш, яны павядуць цябе, калі ляжаш спаць, будуць пільнаваць цябе, калі абудзішся, будуць гаварыць да цябе.
23 Бо прыказаньне — сьветач, і закон — сьвятло, а настаўленьне і дакараньне — шлях жыцьця,
24 каб захаваць цябе ад жанчыны ліхой, ад лісьлівага языка чужаніцы.
25 Няхай не пажадае сэрца тваё прыгажосьці яе, няхай ня ўхопіць яна цябе вейкамі сваімі,
26 бо з прычыны распусьніцы галеюць да бохана хлеба, і чужаложніца цікуе на дарагую душу.
27 Ці схавае хто агонь у запазуху, каб не загарэлася адзеньне ягонае?
28 Ці можа хто хадзіць па распаленым вугольлі, не апёкшы ступняў сваіх?
29 Так і той, хто ўваходзіць да жонкі бліжняга свайго, хто дакранаецца да яе, не пазьбегне кары.
30 Не пагарджаюць злодзеем, калі ён крадзе, каб насыціць душу сваю, калі ён галодны,
31 але злоўлены, сямікроць аддасьць, аддасьць усю маёмасьць дому свайго.

32 Хто чужаложыць з жанчынаю, той бязглузды; загубіць душу сваю той, хто гэтак чыніць.
33 Біцьцё і сорам знойдзе ён сабе, і ганьба яго ня змыецца,
34 бо рэўнасьць раз'юшвае мужа, і не пашкадуе ён у дзень помсты,
35 ня гляне ён на ніякую аднагароду і адкіне дары, хоць іх павялічыш.

Разьдзел 7

1 Сыне мой, прыймі словы мае і захоўвай у сабе прыказаньні мае.
2 Захоўвай прыказаньні мае і жыві, і закон мой — як зрэнку вока твайго.
3 Навяжы іх на пальцы твае, напішы іх на табліцах сэрца твайго.
4 Скажы мудрасьці: «Ты — сястра мая», і розум назаві сябрам,
5 каб яны захавалі цябе ад чужой жонкі, ад чужаніцы, што гаворыць словы лісьлівыя.
6 Вось, глядзеў я праз вакно дому свайго, праз краты свае,
7 і ўбачыў сярод неразумных, заўважыў сярод маладых людзей юнака легкадумнага,
8 як праходзіў вуліцай каля рогу яе, як ішоў дарогаю ў дом яе,
9 у поцемках, у позьні час, у начной цемры і змроку.
10 І вось выходзіць насустрач яму жанчына, у распусным адзеньні, з падступным сэрцам,
11 галасьлівая і нястрыманая, ногі яе не бываюць у доме яе:
12 ці то на вуліцы, ці то на плошчы, і на кожным рагу растаўляе пасткі.
13 І схапіла яго, цалавала яго, і з бессаромным тварам казала яму:
14 «У мяне ахвяра мірная, сёньня споўніла абяцаньні мае,
15 таму выйшла на спатканьне табе, прагнула бачыць аблічча тваё і знайшла цябе.
16 Дыванамі я заслала ложак мой, шматколернымі тканінамі з Эгіпту,
17 пакой мой пасыпала мірам, альвасам і цынамонам.
18 Прыйдзі, будзем цешыцца пяшчотамі да раніцы, атрымліваць асалоду ад каханьня.
19 Бо няма мужа ў доме, выбраўся ў далёкую дарогу,
20 капшук з грашыма ўзяў з сабою, у дзень поўні месяца мае вярнуцца дамоў».
21 Мноствам ласкавых словаў прывабіла яго, лісьлівасьцю вуснаў сваіх зьвяла яго.
22 Ён адразу пайшоў за ёю, як вол, ведзены на зарэз, як бязглузды, на ланцугу ведзены на пакараньне,
23 аж пакуль страла праб'е вантробы яго; як птушка, што кідаецца ў сіло, і ня ведае, што на загубу яе.
24 Дык цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і зважайце на словы вуснаў маіх.
25 Няхай не схіляецца сэрца тваё да шляхоў яе, і не блукай па сьцежках яе,
26 бо шматлікія пакалечаныя ёю, і мноства магутных яна загубіла.
27 Дом ейны — шлях у пекла, які вядзе ў сутарэньні сьмерці.

Разьдзел 8

1 Ці ж мудрасьць ня кліча? Ці ж розум ня ўзносіць голас свой?
2 На вяршынях гораў, пры дарозе, на ростанях стаіць яна,
3 каля брамаў, пры ўваходзе ў горад, пры дзьвярах кліча яна.
4 «Да вас, людзі, я клічу, да сыноў чалавечых голас мой!
5 Навучыцеся, неразумныя, цьвярозаму мысьленьню, і вы, бязглуздыя, прыдбайце сэрца разумнае.
6 Слухайце, бо буду гаварыць пра рэчы важныя, і расчыняцца вусны мае, каб сказаць рэчы справядлівыя.
7 Бо праўду выкажа язык мой, і няправасьць — брыдота для вуснаў маіх.
8 Выслоўі вуснаў маіх праведныя, няма ў іх хлусьні і крывадушнасьці.
9 Усе яны простыя для разумнага і правыя для тых, што знайшлі веданьне.
10 Прыйміце настаўленьне маё, а ня срэбра; лепш веды, чым чыстае золата,
11 бо мудрасьць лепшая за пэрлы, і ніякія каштоўнасьці не параўнаюцца з ёю.

12 Я, мудрасьць, жыву разам з цьвярозым мысьленьнем і шукаю веданьня і разважлівасьці.
13 Страх перад ГОСПАДАМ — ненавідзець ліхоту, пыху і фанабэрыстасьць; шляхі ліхія і вусны
крывадушныя я ненавіджу.
14 У мяне рада і сапраўдная мудрасьць, я — розум, у мяне сіла.
15 Дзякуючы мне валадары валадараць і князі дзейнічаюць праведна.
16 Дзякуючы мне начальнікі кіруюць, і магнаты, і ўсе судзьдзі зямлі.
17 Я люблю тых, якія мяне любяць, і тыя, што мяне шукаюць, знойдуць мяне.
18 У мяне багацьце і слава, незьнішчальныя скарбы і праведнасьць.
19 Плод мой лепшы за золата, і золата найчысьцейшае; і карысьць ад мяне лепшая за срэбра
адборнае.
20 Я хаджу сьцежкамі праведнасьці і шляхамі правасудзьдзя,
21 каб даць тым, што любяць мяне, у спадчыну даброцьці, і скарбніцы іх я напоўню.
22 ГОСПАД меў мяне на пачатку шляху Свайго, раней стварэньняў Сваіх, спакон вякоў.
23 Спрадвеку я пастаўлена, ад пачатку, перш, чым зямля паўстала.
24 Я нарадзілася, калі яшчэ не было бяздоньняў, калі не было крыніцаў, напоўненых водамі.
25 Перш, чым горы былі асаджаны, перад узгоркамі я нарадзілася,
26 калі Ён яшчэ не стварыў ані зямлі, ані палёў, ані пачатковых пылінак сусьвету.
27 Калі Ён прыгатоўваў нябёсы, я была там. Калі Ён крэсьліў скляпеньне над абліччам
бяздоньня,
28 калі засноўваў аблокі ўгары, калі ўмацоўваў крыніцы бяздоньня,
29 калі вызначаў для мора статут ягоны, каб воды не перакрочвалі межы свае, калі закладаў
падваліны зямлі,
30 я была ў Яго дойлідам і была пацехай [Яго] кожны дзень, радуючыся перад абліччам Яго
кожны час,
31 радуючыся на заселенай зямлі Яго, і пацеха мая — з сынамі чалавечымі.
32 І цяпер, дзеці, паслухайце мяне, і шчасьлівыя тыя, якія трымаюцца шляхоў маіх.
33 Слухайце настаўленьне, і будзеце мудрымі, і не адкідайце яго.
34 Шчасьлівы чалавек, які слухае мяне, чуваючы кожны дзень пры брамах маіх, стоячы на
варце пры парозе дзьвярэй маіх.
35 Бо хто знойдзе мяне, знойдзе жыцьцё і атрымае ласку ад ГОСПАДА,
36 а хто грашыць супраць мяне, шкодзіць душы сваёй; усе, якія ненавідзяць мяне, любяць
сьмерць».

Разьдзел 9

1 Мудрасьць пабудавала сабе дом, вычасала сем слупоў ягоных,
2 закалола тое, што было на зарэз, зьмяшала віно і прыгатавала стол свой.
3 Паслала служак сваіх, кліча на дзядзінцу і на вышынях гарадзкіх:
4 «Хто неразумны, няхай прыйдзе сюды», а да бязглуздага кажа:
5 «Прыходзьце, ешце хлеб мой і піце віно, якое я зьмяшала,
6 пакіньце дурноту і жывіце, і хадзіце шляхам розуму».
7 Хто павучае насьмешніка, сьцягвае на сябе прыкрасьць, а хто дакарае бязбожніка,
заплямiцца.
8 Не дакарай насьмешніка, каб ён не зьненавідзеў цябе, дакарай мудрага, і ён будзе любіць
цябе.
9 Настаўляй мудрага, і ён стане мудрэйшы; вучы праведнага, і ён павялічыць веды.
10 Пачатак мудрасьці — страх перад ГОСПАДАМ, і веданьне Сьвятога — розум.
11 Бо праз мяне памножацца дні твае і дададуцца гады жыцьця твайго.
12 Калі будзеш мудры, для сябе будзеш мудры, а калі станеш насьмешнікам — сам будзеш мець
шкоду.
13 Дурнота — жанчына крыклівая, неразумная і нічога ня ведае;
14 сядзіць каля дзьвярэй дому свайго на пасадзе, на вышынях гарадзкіх,

15 каб клікаць тых, што праходзяць дарогаю, што ідуць проста сьцежкамі сваімі:
16 «Хто неразумны, няхай прыйдзе сюды», а да бязглуздага кажа:
17 «Вада крадзеная салодкая, і схаваны хлеб смачнейшы».
18 І ня ведае той, што там мерцьвякі, і што ў цемры адхлані запрошаныя ёю.

Разьдзел 10

1 Прыповесьці Салямона. Мудры сын — радасьць для бацькі, а дурны сын — смутак для маці.
2 Не прыносяць карысьці скарбы бязбожныя, а праведнасьць ратуе ад сьмерці.
3 Не дазволіць ГОСПАД галадаваць душы праведніка, але адкіне жаданьні бязбожнікаў.
4 Лянівая рука робіць бедным, а рука працавітая ўзбагачае.
5 Хто летам зьбірае, той сын разважлівы, а хто сьпіць у жніво — сын ганебны.
6 Дабраславенствы — на галаве праведнага, а вусны бязбожнікаў хаваюць няправасьць.
7 Памяць пра праведніка дабраслаўлёная, а імя бязбожнікаў спарахнее.
8 Мудры сэрцам прыймае прыказаньні, а той, хто мае вусны неразумныя, упадзе.
9 Хто ходзіць беззаганна, той ходзіць бясьпечна, а хто крывіць шляхі свае, будзе выяўлены.
10 Хто міргае вачыма, той робіць прыкрасьць, і той, хто мае вусны неразумныя, упадзе.
11 Вусны праведніка — крыніца жыцьця, а вусны бязбожнікаў хаваюць няправасьць.
12 Нянавісьць выклікае сваркі, а любоў пакрывае ўсе правіны.
13 У вуснах разумнага знаходзіцца мудрасьць, а кій — на сьпіне бязглуздага.
14 Мудрыя захоўваюць веданьне, а вусны неразумнага вядуць да загубы.
15 Маёмасьць багатага — умацаваны горад для яго, загуба для бедных — галеча іхняя.
16 Праца праведніка вядзе да жыцьця, набытак бязбожніка — да грэху.
17 На сьцежцы жыцьця той, хто прыймае настаўленьне, а хто адкідае дакараньне — блукае.
18 Хто хавае нянавісьць, у таго вусны хлусьлівыя, а хто паклёп разносіць, той дурань.
19 У мностве словаў не пазьбегнеш грэху, а хто стрымлівае вусны свае, той разважлівы.
20 Язык праведніка — адборнае срэбра, а сэрца бязбожніка нічога ня вартае.
21 Вусны праведнага пасьвяць многіх, а бязглуздыя паміраюць ад нястачы розуму.
22 Дабраславенства ад ГОСПАДА, яно ўзбагачае, і смутку з сабою не прыносіць.
23 Радасьць для дурня — учынкі ганебныя, а чалавек разумны [радуецца] мудрасьці.
24 Тое, чаго баіцца бязбожнік, прыйдзе на яго, а прагненьні праведных споўняцца.
25 Калі пранясецца віхура, ня будзе больш бязбожніка, а праведнік мае вечны падмурак.
26 Як воцат для зубоў і як дым для вачэй, так гультай для тых, што яго пасылаюць.
27 Страх перад ГОСПАДАМ памнажае дні, а гады бязбожнікаў скароцяцца.
28 Чаканьне праведнікаў — радасьць, а спадзяваньне бязбожнікаў загіне.
29 Шлях ГОСПАДАЎ — апора для беззаганных і загуба для злачынцаў.
30 Праведнік не пахісьнецца навекі, а бязбожнікі ня будуць жыць на зямлі.
31 Вусны праведніка памнажаюць мудрасьць, а язык падступны будзе адсечаны.
32 Вусны праведніка ведаюць, што даспадобы [Богу], а ў вуснах бязбожнікаў — падступнасьць.

Разьдзел 11

1 Агіда для ГОСПАДА — шалі падманлівыя, а вагі дакладныя даспадобы Яму.
2 Прыходзіць пыхлівасьць, прыходзіць і ганьба, а ў пакорлівых — мудрасьць.
3 Беззаганнасьць правых вядзе іх, а крывадушнасьць здрадлівых загубіць іх.
4 Не дапаможа багацьце ў дзень гневу, а праведнасьць ратуе ад сьмерці.
5 Праведнасьць беззаганнага раўняе шлях ягоны, а бязбожнік падае праз бязбожнасьць сваю.
6 Праведнасьць правых ратуе іх, а ліхадзеі будуць злоўленыя злачынствам сваім.
7 Калі памірае чалавек бязбожны, гіне надзея [яго], і спадзяваньне злачынцаў прападае.
8 Праведнік ратуецца ад бяды, а бязбожнік прыходзіць на месца яго.
9 Крывадушнік вуснамі забівае бліжняга свайго, а праведнік ратуецца праз веданьне.

10 Калі добра ідзе праведным, радуецца горад, і калі гінуць бязбожнікі, [горад] сьвяткуе.
11 Дабраславенствам правых узвышаецца горад, а вуснамі бязбожнікаў руйнуецца.
12 Той, хто пазбаўлены розуму, пагарджае бліжнім сваім, а чалавек разумны захоўвае мір.
13 Хто ходзіць з абмовамі, адкрывае таямніцу, а той, хто верны духам, захоўвае слова.
14 Дзе няма добрай рады, народ прападае, а пры мностве дарадцаў — выратаваньне.
15 Шкодзіць сабе той, хто паручаецца за чужога, а хто ненавідзіць даваць руку, той бясьпечны.
16 Дабрадзейная жанчына здабывае славу, і моцныя здабываюць багацьце.
17 Чалавек міласэрны робіць дабро душы сваёй, а бязьлітасны нішчыць цела сваё.
18 Падманлівы набытак здабудзе бязбожнік, а таму, хто сее праведнасьць, будзе пэўная нагарода.
19 Праведнасьць [вядзе] да жыцьця, а хто імкнецца да зла, [імкнецца] да сьмерці.
20 Агіда для ГОСПАДА крывадушныя сэрцам, але тыя, хто ходзяць беззаганна, даспадобы Яму.
21 Можна паручыцца, зло не пазьбегне пакараньня, а насеньне праведных будзе збаўленае.
22 Як залатое колца ў лычы сьвіньні, так прыгожая жанчына, але бяз розуму.
23 Прагненьне праведнікаў — толькі дабро, а чаканьне бязбожнікаў — гнеў.
24 Адзін сыпе [шчодра], і дадаецца яму, а другі лішне ашчадны, і бяднее.
25 Дабрадзейная душа будзе насычана, і хто поіць [другіх], сам напоены будзе.
26 Хто затрымлівае збожжа, таго праклінае народ, але дабраславенства на галаве таго, хто продае.
27 Хто імкнецца да дабра, той шукае зычлівасьці, а хто шукае зла, да таго яно прыйдзе.
28 Хто спадзяецца на багацьце сваё, упадзе, а праведнікі, як лісьце, зелянеюць.
29 Хто руйнуе дом свой, атрымае ў спадчыну вецер, і неразумны будзе слугою мудрага сэрцам.
30 Плод праведнага — дрэва жыцьця, і мудры здабывае душы.
31 Вось, праведнік будзе мець адплату на зямлі, пагатоў бязбожнік і грэшнік.

Разьдзел 12

1 Хто любіць настаўленьне, любіць веданьне, а хто ненавідзіць дакараньне, той дурань.
2 Добры знойдзе ласку ў ГОСПАДА, але чалавека зламыснага Ён асудзіць.
3 Ня будзе стаяць чалавек бязбожнасьцю, а корань праведных не захістаецца.
4 Дабрадзейная жонка — карона для мужа свайго, а бессаромная — як гніль у костках ягоных.
5 Думкі праведных слушныя, намеры бязбожнікаў падступныя.
6 Словы бязбожнікаў цікуюць на кроў, але вусны правых ратуюць іх.
7 Паваленыя бязбожнікі, і няма іх, а дом праведных будзе стаяць.
8 Хваляць чалавека паводле розуму ягонага, але той, хто мае ліхое сэрца, будзе пагарджаны.
9 Лепей быць простым і працаваць на сябе, чым выдаваць сябе за паважнага і ня мець хлеба.
10 Праведнік рупіцца пра жыцьцё быдла свайго, а нутро бязбожных бязьлітаснае.
11 Хто абрабляе зямлю сваю, той насыціцца хлебам, а хто ганяецца за марнасьцю, той ня мае розуму.
12 Бязбожнік жадае [злавіць у] пасткі ліхоцьця, а корань праведных прыносіць [плод].
13 Ліхадзей заблытаецца праз правіны вуснаў сваіх, а праведнік выйдзе з бяды.
14 З плоду вуснаў сваіх чалавек насыціцца дабром, і праца рук чалавека зьвернецца да яго.
15 Шлях неразумнага слушны ў вачах ягоных, але мудры той, хто слухае параду.
16 Гнеў неразумнага выяўляецца адразу, а разумны хавае зьнявагу.
17 Хто дыхае праўдаю, той выкажацца праведна, а сьведка фальшывы хлусіць.
18 Ёсьць такі, што лапоча і раніць, як мечам, а язык мудрага лечыць.
19 Вусны праўдамоўныя трываць будуць вечна, а язык хлусьлівы — імгненьне.
20 Ашуканства ў сэрцы тых, якія задумляюць ліхоту, а ў тых, якія радзяць мір, — радасьць.
21 Не спаткае праведніка нічога благога, а ў бязбожніка будзе поўна няшчасьцяў.
22 Агіда для ГОСПАДА вусны хлусьлівыя, а тыя, што дзейнічаюць сумленна, падабаюцца Яму.
23 Чалавек разумны прыхоўвае веданьне, а сэрца дурняў абвяшчае глупства.

24 Рука руплівых будзе мець уладу, а нядбайныя будуць даньнікамі.
25 Смутак у сэрцы чалавека прыгнятае яго, а добрае слова разьвяселіць яго.
26 Праведнік мае перавагу над бліжнім сваім, а шлях бязбожнікаў зводзіць іх саміх.
27 Гультай не сьпячэ ўпаляванага, а маёмасьць чалавека руплівага каштоўная.
28 На сьцежцы праведнасьці — жыцьцё, і на шляху яе няма сьмерці.

Разьдзел 13

1 Мудры сын [слухае] настаўленьне бацькі, а насьмешнік ня слухае дакараньня.
2 З плоду вуснаў сваіх чалавек будзе жывіцца дабром, а душа ліхадзеяў — гвалтам.
3 Хто захоўвае вусны свае, захоўвае душу сваю, а хто шырока адкрывае рот свой, будзе мець зьнішчэньне.
4 Душа гультая жадае і ня мае нічога, а душа руплівага будзе насычаная.
5 Праведнік ненавідзіць слова хлусьлівае, а бязбожнік ганьбіць і зьневажае [сябе].
6 Праведнасьць захоўвае таго, хто беззаганны ў шляху [сваім], а бязбожнасьць губіць грэшніка.
7 Адзін выдае сябе за багатага, нічога ня маючы, іншы выдае сябе за беднага, маючы шмат багацьця.
8 Выкуп душы чалавека — багацьце ягонае, а бедны пагрозы ня чуе.
9 Сьвятло праведных радасна зьзяе, а сьветач бязбожнікаў стухне.
10 Пыхлівасьць толькі да звадкі прыводзіць, а ў тых, што парады прыймаюць, — мудрасьць.
11 Багацьце, [здабытае] марным чынам, змалее, а хто зьбірае яго рукою сваёю, — памнажае яго.
12 Спадзяваньне, якое доўжыцца, — боль сэрца, а зьдзейсьненае жаданьне — дрэва жыцьця.
13 Хто пагарджае Словам, той будзе зьнішчаны, а хто баіцца прыказаньняў, атрымае ўзнагароду.
14 Закон мудрага — крыніца жыцьця, каб пазьбегнуць пастак сьмерці.
15 Добры розум дае зычлівасьць, а шлях ліхадзеяў цяжкі.
16 Кожны разумны дзейнічае з веданьнем, а дурны выяўляе неразумнасьць.
17 Бязбожны пасланец трапляе ў бяду, а верны пасол [прыносіць] аздараўленьне.
18 Галеча і ганьба таму, хто адкідае настаўленьне, а той, хто прыймае дакараньні, будзе ў пашане.
19 Споўненае жаданьне — асалода для душы, але адвярнуцца ад зла — агіда для дурня.
20 Хто ходзіць з мудрым, будзе мудрым, а хто сябруе з дурнем, загалосіць.
21 Ліха гоніцца за грэшнікамі, а праведным будзе аднагароджана дабром.
22 Добры пакідае спадчыну і ўнукам, а багацьце грэшнікаў захоўваецца для праведных.
23 Многа хлеба і на ніве бедных, але некаторыя гінуць, бо няма суду.
24 Хто шкадуе дубца свайго, той ненавідзіць сына свайго, а хто любіць яго, той з маленства настаўляе яго.
25 Праведнік есьць і насычае душу сваю, а нутро бязбожнікаў будзе ў нястачы.

Разьдзел 14

1 Мудрая жонка будуе сабе дом, а неразумная руйнуе яго сваімі рукамі.
2 Хто ходзіць проста, той баіцца ГОСПАДА, а хто крывіць шляхі свае, той грэбуе Ім.
3 У вуснах неразумнага дубец пыхлівасьці, а вусны мудрых захоўваюць іх.
4 Дзе няма скаціны, там ясьлі пустыя, але багата прыбытку ад сілы вала.
5 Сьведка праўдзівы ня схлусіць, а сьведка фальшывы дыхае няпраўдай.
6 Насьмешнік шукае мудрасьці, і яе няма, але веданьне лёгкае для разумнага.
7 Адыйдзі ад чалавека дурнога, бо ня знойдзеш вуснаў разумных.
8 Мудрасьць разумнага — у разуменьні шляху свайго, а неразумнасьць дурняў — у ашуканстве.
9 Неразумныя сьмяюцца з віны, а пасярод правых — зычлівасьць.
10 Сэрца ведае горыч душы сваёй, і ў радасьць ягоную ня ўвойдзе чужынец.
11 Дом бязбожнікаў будзе зьнішчаны, а намёт правых закрасуе.

12 Ёсьць шлях, які слушны ў вачах чалавека, але канец яго — шляхі сьмерці.
13 І ў часе сьмеху баліць сэрца, і заканчэньне радасьці — смутак.
14 Падступны сэрцам насыціцца шляхамі сваімі, а добры чалавек — сваімі.
15 Неразумны верыць кожнаму слову, а разумны разважае пра крокі свае.
16 Мудры баіцца і адварочваецца ад зла, а дурны гняўлівы і самаўпэўнены.
17 Скоры на гнеў робіць дурасьць, а чалавек зламысны зьненавіджаны.
18 Неразумныя атрымліваюць у спадчыну дурасьць, а разумныя ўкаранаюцца веданьнем.
19 Ліхія паклоняцца перад добрымі, а бязбожнікі — каля брамаў праведнікаў.
20 Бедны зьненавіджаны нават бліжнім сваім, але шмат тых, хто любіць багатага.
21 Хто цураецца бліжняга свайго, той грашыць, а хто літуецца над бедным, той шчасьлівы.
22 Ці ж не заблукалі тыя, якія задумляюць зло? Але міласэрнасьць і праўда будзе тым, якія задумляюць добрае.
23 З кожнае працы будзе прыбытак, а ад пустых словаў — толькі нястача.
24 Карона мудрых — багацьце іхняе, а вянок дурняў — глупства іхняе.
25 Сьведка праўдзівы ратуе душы, а хлусьлівы дыхае няпраўдай.
26 У страху перад ГОСПАДАМ моцная пэўнасьць, і для сыноў Сваіх Ён будзе прыстанішчам.
27 Страх перад ГОСПАДАМ — крыніца жыцьця, каб пазьбегнуць пастак сьмерці.
28 У мностве народу веліч валадара, а ў малалікасьці людзей — загуба князя.
29 У павольнага на гнеў багата розуму, а запальчывы выяўляе дурасьць.
30 Лагоднае сэрца — жыцьцё для цела, а зайздрасьць — парахненьне косткам.
31 Хто прыгнятае ўбогага, той зьневажае Творцу ягонага, але шануе Яго той, хто літуецца над бедным.
32 Бязбожнік будзе адкінуты за ліхоцьце сваё, а праведнік і пры сьмерці сваёй мае надзею.
33 У сэрцы разумнага жыве мудрасьць, і паміж дурняў яна вядомая.
34 Праведнасьць узвышае народ, а грэх — ганьба для народаў.
35 Зычлівы валадар да слугі разумнага, але абурэньне ягонае на таго, хто асаромлівае яго.

Разьдзел 15

1 Лагодны адказ адхіляе ярасьць, а слова абразьлівае выклікае гнеў.
2 Язык мудрых прыносіць веды, а вусны неразумных выказваюць глупства.
3 Вочы ГОСПАДА на кожным месцы, яны бачаць добрых і ліхіх.
4 Здаровы язык — дрэва жыцьця, а зласьлівы — заламаньне духа.
5 Неразумны грэбуе настаўленьнем бацькі, а хто зважае на дакараньні — разумнее.
6 У доме праведніка шмат багацьця, а ў набытках бязбожніка — замяшаньне.
7 Вусны мудрых сеюць веды, а сэрца бязглуздых не такое.
8 Ахвяра бязбожнікаў — агіда для ГОСПАДА, а малітвы правых Яму даспадобы.
9 Агіда для ГОСПАДА — шлях бязбожніка, а таго, хто імкнецца да праведнасьці, Ён любіць.
10 Таму, хто ўхіляецца з дарогі, — строгая кара, і той, хто дакараньне ненавідзіць, — памрэ.
11 Адхлань і пекла перад [вачыма] ГОСПАДА, а тым больш сэрцы сыноў чалавечых.
12 Насьмешнік ня любіць таго, хто яго дакарае, і да мудрых ня пойдзе.
13 Радаснае сэрца робіць аблічча вясёлым, а калі сэрца сумуе — дух разьбіты.
14 Сэрца разумнае шукае веданьня, а вусны неразумных жывяцца дурнотаю.
15 Усе дні прыгнечанага ліхія, а ў каго добра на сэрцы, у таго заўсёды бяседа.
16 Лепш малое ў страху перад ГОСПАДАМ, чым вялікія скарбы, а з імі трывога.
17 Лепш крыху гародніны з любоўю, чым тлусты вол з нянавісьцю.
18 Чалавек гняўлівы выклікае звадкі, а няскоры да гневу супакойвае спрэчку.
19 Шлях гультая як жываплот з церня, а сьцежка правых — гладкая.
20 Мудры сын — радасьць для бацькі, а дурны чалавек пагарджае маці сваёй.
21 Дурасьць — радасьць для невука, а чалавек разумны ідзе простай дарогай.

22 Бяз рады руйнуюцца намеры, а з мноствам дарадцаў яны зьдзяйсьняюцца.
23 Радуецца чалавек з адказу вуснаў сваіх, і якое добрае слова адпаведнае.
24 Сьцежка жыцьця ў разважлівага [вядзе] ўгару, каб пазьбегнуць адхлані, якая ў доле.
25 ГОСПАД развальвае дом пыхліўцаў, а мяжу ўдавы Ён вызначае.
26 Агіда для ГОСПАДА — думкі бязбожных, а прамовы чыстыя прыемныя [Яму].
27 Нішчыць свой дом сквапны да зыску, а хто ненавідзіць падарункі, будзе жыць.
28 Сэрца праведніка разважае пра адказ, а вусны бязбожнікаў вымаўляюць ліхоту.
29 ГОСПАД далёка ад бязбожнікаў, але малітвы праведных Ён чуе.
30 Сьвятло вачэй радуе сэрца, і добрая вестка ўмацоўвае косткі.
31 Вуха, якое слухае дакараньні жыцьця, будзе жыць сярод мудрых.
32 Хто адкідае настаўленьне, грэбуе душою сваёю, а хто слухае дакараньні, здабывае розум.
33 Страх перад ГОСПАДАМ навучае мудрасьці, і ўпакораньне папераджае славу.

Разьдзел 16

1 Да чалавека [належыць] меркаваньне сэрца, але ад ГОСПАДА адказ языка.
2 Усе шляхі чалавека чыстыя ў вачах ягоных, але ГОСПАД узважвае душы.
3 Ускладзі на ГОСПАДА ўсе справы свае, і ўсе намеры твае зьдзейсьняцца.
4 Усё зрабіў ГОСПАД дзеля Сябе, і нават бязбожніка на дзень ліхі.
5 Агіда для ГОСПАДА кожны пыхлівы сэрцам, можна паручыцца, ён не застанецца непакараным.
6 Міласэрнасьцю і праўдай адкупляецца беззаконьне, і страх перад ГОСПАДАМ адводзіць ад зла.
7 Калі ГОСПАДУ даспадобы шляхі чалавека, Ён нават ворагаў ягоных пагодзіць з ім.
8 Лепш малое ў праведнасьці, чым багатыя прыбыткі ў беззаконьні.
9 Сэрца чалавека абдумвае шлях свой, але ГОСПАД накіроўвае крокі ягоныя.
10 Калі слова натхнёнае ў вуснах валадара, у судзе ня будзе падступным язык ягоны.
11 Вага і шалі справядлівыя — ад ГОСПАДА, і ўсе камяні ваговыя ў торбе — справа Ягоная.
12 Агіда для валадара — учынкі бязбожныя, бо пасад умацоўваецца праведнасьцю.
13 Падабаюцца валадару вусны праведныя, і таго, хто гаворыць праўдзіва, ён любіць.
14 Гнеў валадара — весьнік сьмерці, але мудры чалавек улагодзіць яго.
15 У сьвятле аблічча валадара — жыцьцё, і зычлівасьць ягоная — як воблака з позьнім дажджом.
16 Нашмат лепш прыдбаць мудрасьць, чым золата, і лепей прыдбаць розум, чым срэбра.
17 Шырокая дарога правых — адвярнуцца ад зла; хто пільнуе шлях свой, той захоўвае душу сваю.
18 Перад загубай ідзе пыхлівасьць, і перад падзеньнем — дух ганарысты.
19 Лепш скарацца духам з пакорнымі, чым дзяліць здабычу з пыхліўцамі.
20 Разважлівы ў слове знойдзе добрае, і той, хто спадзяецца на ГОСПАДА, — шчасьлівы.
21 Мудрага сэрцам называюць разумным, і слодыч вуснаў павялічвае веды.
22 Розум — крыніца жыцьця для тых, хто мае яго, але настаўленьне неразумных — глупства.
23 Сэрца мудрага робіць разважлівымі вусны ягоныя і мове ягонай дадае ведаў.
24 Прыемныя словы — сотавы мёд, асалода для душы і лекі для цела.
25 Ёсьць шлях, які [падаецца] слушным перад абліччам чалавека, але ў канцы ягоным — шлях сьмерці.
26 Работнік цяжка працуе для сябе, бо рот ягоны прымушае яго.
27 Чалавек нягодны ліхоцьце рыхтуе, і ў вуснах ягоных нібы агонь палючы.
28 Чалавек падступны сее звадкі, і пляткар разьдзяляе сяброў.
29 Чалавек злачынны зводзіць бліжняга свайго і вядзе яго на шлях нядобры,
30 прыплюшчвае вочы свае, каб прыдумляць подступ, крывіць губы свае, робячы ліха.
31 Сівізна — слаўная карона, на шляху праведнасьці знаходзяць яе.

32 Лепш павольны на гнеў, чым магутны, і той, які пануе над духам сваім, чым заваёўнік гораду.
33 Жэрабя кідаюць у заўлоньне, але ад ГОСПАДА ўсе суды яго.

Разьдзел 17

1 Лепш сухая луста ў супакоі, чым дом, поўны заколатай жывёлы, са сваркамі.
2 Разумны слуга будзе панаваць над шалапутным сынам і між братоў будзе дзяліць спадчыну.
3 Літавальны гаршчок — для срэбра, і горан — для золата, а сэрцы выпрабоўвае ГОСПАД.
4 Ліхотнік зважае на вусны нягодныя, хлус слухае язык згубны.
5 Хто насьміхаецца з беднага, той зьневажае Творцу ягонага, і хто цешыцца з няшчасьця, не пазьбегне пакараньня.
6 Карона старых — сыны сыноў, і слава сыноў — бацькі іхнія.
7 Не пасуе бязглуздаму паважная мова, тым больш шляхетнаму вусны брахлівыя.
8 Хабар — каштоўны камень у вачах гаспадара яго, куды толькі зьвернецца ён, будзе мець посьпех.
9 Хто прыкрывае правіну, шукае любові, а хто паўтарае слова, разьдзяляе сяброў.
10 Мацней дзейнічае нагана на разумнага, чым сто ўдараў на дурнога.
11 Ліхадзей шукае толькі непаслухмянства, таму бязьлітасны анёл будзе пасланы супраць яго.
12 [Лепш] спаткаць мядзьведзіцу, пазбаўленую дзяцей, чым дурня ў неразумнасьці ягонай.
13 Хто адплочвае злом за дабро, у таго зло не адыйдзе ад дому ягонага.
14 Пачатак звадкі — прарыў вады, перш, чым спрэчка пачнецца, пакінь [яе].
15 Той, хто апраўдвае злачынцу, і той, хто вінаваціць праведніка, — абодва агіда для ГОСПАДА.
16 Навошта грошы ў руцэ дурнога, каб набыць мудрасьці, калі няма розуму?
17 Сябра любіць у кожны час, і ў нядолі робіцца братам.
18 Чалавек, пазбаўлены розуму, дае руку і ручаецца перад абліччам бліжняга свайго.
19 Хто любіць сваркі, любіць грэх, і хто падымае высока вароты свае, шукае загубы.
20 Крывадушнае сэрца ня знойдзе дабра, і язык здрадлівы трапіць у бяду.
21 Хто нараджае неразумнага, [нараджае] на смутак сабе, і бацька бязглуздага ня будзе цешыцца.
22 Радаснае сэрца аздараўляе, [нібы] лекі, а маркотны дух сушыць косткі.
23 Бязбожнік бярэ хабар з-за пазухі, каб скрывіць сьцежкі правасудзьдзя.
24 Перад абліччам разумнага — мудрасьць, а вочы дурня — на канцы зямлі.
25 Сын неразумны — згрызота для бацькі свайго і горыч для той, якая яго нарадзіла.
26 Таксама нядобра караць праведніка і біць шляхетнага за шчырасьць.
27 Хто мае веданьне, той у словах ашчадны, і чалавек разумны мае спакойны дух.
28 Таксама неразумны, калі маўчыць, лічыцца мудрым, і калі закрывае вусны свае, разважлівым.

Разьдзел 18

1 Свавольны шукае жаданьня [свайго] і кожнай цьвярозай думцы працівіцца.
2 Дурань ня хоча застанаўляцца, а толькі каб выявіць розум свой.
3 Калі прыходзіць бязбожнік, прыходзіць пагарда, і разам з сорамам — ганьба.
4 Словы вуснаў чалавечых — глыбокія воды, крыніца мудрасьці — бурлівы ручай.
5 Нядобра зважаць на аблічча бязбожнага, каб паваліць праведнага на судзе.
6 Словы дурня прыводзяць да спрэчкі, і вусны ягоныя выклікаюць бойку.
7 Вусны дурня — загуба ягоная, а мова ягоная — пастка для душы яго.
8 Словы пляткара — як прысмакі, яны зыходзяць у глыб нутра.
9 Нядбайны ў рабоце сваёй — брат нішчыцеля.
10 Імя ГОСПАДА — магутная вежа, пабяжыць туды праведнік і будзе ў бясьпецы.
11 Маёмасьць багатага — умацаваны горад для яго, уяўляецца яна яму як муры высокія.

12 Перад загубай вывышаецца сэрца чалавека, а ўпакораньне папераджае славу.
13 Хто дае адказ раней, чым выслухае, той неразумны, і сорам яму.
14 Дух чалавека пераносіць немач сваю, але дух маркотны хто можа ўзьняць.
15 Сэрца разважнае набывае веды, і вуха мудрых шукае веданьня.
16 Падарунак чалавека дае яму прастору і да вялікіх прывядзе яго.
17 Першы ў спрэчцы сваёй [падаецца] справядлівым, але прыйдзе бліжні ягоны і выспрабуе яго.
18 Жэрабя спыняе сваркі і дзеліць між магутнымі.
19 Пакрыўджаны брат — як умацаваны горад, а сваркі — як завалы ў замку.
20 З плоду вуснаў сваіх насыціць чалавек нутро сваё, з прыбыткаў губаў сваіх насыціцца.
21 Сьмерць і жыцьцё ў руцэ языка; хто любіць яго, будзе есьці плады ягоныя.
22 Хто знайшоў жонку, той знайшоў добрае і атрымаў ласку ад ГОСПАДА.
23 Бедны гаворыць, умольваючы, а багаты адказвае груба.
24 Чалавек, які мае сяброў, сам павінен быць сяброўскі, і бывае, што сябар больш любіць, чым брат.

Разьдзел 19

1 Лепш бедны, які ходзіць у беззаганнасьці сваёй, чым крывадушны вуснамі сваімі, і да таго ж дурны.
2 Таксама нядобра душы бяз ведаў, і хто сьпяшаецца нагамі [сваімі], саграшыць.
3 Неразумнасьць чалавека крывіць шлях ягоны, але сэрца ягонае гневаецца на ГОСПАДА.
4 Маёмасьць дадае шматлікіх сяброў, а ўбогага пакідае бліжні ягоны.
5 Сьведка фальшывы не пазьбегне пакараньня, і хто дыхае няпраўдай, не ўратуецца.
6 Шмат хто паніжаецца перад магнатам, і кожны сябруе з чалавекам, які [дае] падарункі.
7 Усе браты беднага ненавідзяць яго, тым больш сябры ягоныя аддаляюцца ад яго; той бяжыць, каб паразмаўляць, але іх няма.
8 Хто набывае розум, той любіць душу сваю, хто шукае разважлівасьці — знаходзіць дабро.
9 Сьведка фальшывы не пазьбегне пакараньня, і хто дыхае няпраўдай, загіне.
10 Не пасуе дурню раскоша, тым больш слузе мець уладу над князямі.
11 Розум чалавека стрымлівае гнеў ягоны, і слава яго — у прабачэньні правінаў.
12 Гнеў валадара — як рыканьне ільва, а зычлівасьць ягоная — як раса на траве.
13 Неразумны сын — загуба для бацькі, а сварлівая жонка — як няспыннае капаньне [праз дах].
14 Дом і маёмасьць — спадчына ад бацькоў, але разумная жонка — ад ГОСПАДА.
15 Лянота кідае ў сон, і нядбайная душа будзе цярпець голад.
16 Хто захоўвае прыказаньні — захоўвае душу сваю, хто не шануе шлях Яго — памрэ.
17 Хто літуецца над убогім, той пазычае ГОСПАДУ, за дабрадзейства Ён аднагародзіць яму.
18 Карай сына свайго, пакуль ёсьць надзея, і няхай не спрычыніцца да загубы яго душа твая.
19 Зласьлівы няхай атрымае пакараньне, бо калі пашкадуеш яго, яшчэ больш павялічыш [кару].
20 Слухай парады і прыймай настаўленьне, каб стаўся ты мудрым пры канцы [дзён].
21 Шмат думак у сэрцы чалавека, але збудзецца намер ГОСПАДА.
22 Пажаданая для чалавека міласэрнасьць ягоная, і бедны лепшы за чалавека хлусьлівага.
23 Страх перад ГОСПАДАМ [вядзе] да жыцьця, і такі [чалавек] будзе жыць, і насыціцца, і зло не наведае яго.
24 Гультай хавае руку сваю ў місе, але нават да вуснаў сваіх не падымае яе.
25 Бі насьмешніка, і неразумны паразумнее, дакарай разумнага, і ён здабудзе веданьне.
26 Руйнуе бацьку, выганяе маці сын, які прыносіць сорам і ганьбу.
27 Перастань, сыне мой, слухаць настаўленьні, якія адводзяць ад словаў веданьня.
28 Сьведка нягодны насьміхаецца над судом, і вусны бязбожнікаў глытаюць злачынства.
29 Падрыхтаваныя прысуды для насьмешнікаў, а хвастаньне — на плечы дурняў.

Разьдзел 20

1 Віно зьдзеклівае, сікера галасьлівая, і кожны, хто блукае з імі, ня мае мудрасьці.
2 Ярасьць валадара — як рыканьне ільва, хто выклікае яе, грашыць супраць душы сваёй.
3 Слава для чалавека — пакінуць спрэчку, а ўсе неразумныя задзірлівыя.
4 Гультай ня хоча араць, бо холадна, таму будзе прасіць у час жніва, і [не атрымае] нічога.
5 Намеры ў сэрцы чалавека — глыбокія воды, але разумны чалавек вычэрпвае іх.
6 Багата людзей абвяшчае пра міласэрнасьць сваю, але праўдамоўнага чалавека хто можа знайсьці?
7 Праведнік ходзіць у беззаганнасьці сваёй, шчасьлівыя сыны ягоныя пасьля яго.
8 Валадар, які сядзіць на судовым пасадзе, раскідвае вачыма сваімі ўсякую ліхоту.
9 Хто можа сказаць: «Я ачысьціў сэрца маё, я чысты ад грэху майго»?
10 Неаднолькавыя вагі і неаднолькавая эфа, адно і другое — агіда для ГОСПАДА.
11 Нават у юнака па паводзінах можна зразумець, ці чыстыя, ці правыя справы ягоныя.
12 Вуха, якое чуе, і вока, якое бачыць, — ГОСПАД зрабіў і адно, і другое.
13 Не любі спаць, каб табе не зьбяднець, адкрый вочы свае, і насыцішся хлебам.
14 «Дрэннае, дрэннае», — кажа пакупнік, а калі адыйдзецца, тады хваліцца.
15 Ёсьць золата і мноства пэрлінаў, але найкаштоўнейшая рэч — вусны разумныя.
16 Забяры адзеньне яго, бо ён паручыўся за чужога, і за чужынца вазьмі заклад ад яго.
17 Салодкі чалавеку хлеб ашуканства, але потым пяском напоўняцца вусны ягоныя.
18 Думкі ўмацоўваюцца парадамі, і з разважлівасьцю вядзі вайну.
19 Хто ходзіць абмоўнікам, той выяўляе таямніцы, дык ня зьвязвайся з тым, хто рот свой разьзяўляе.
20 Хто кляне бацьку свайго і маці сваю, у таго сьветач патухне сярод глыбокай цемры.
21 Спадчына, на пачатку пасьпешліва здабытая, ня будзе пры канцы дабраслаўлёная.
22 Не кажы: «Я адплачу за зло», спадзявайся на ГОСПАДА, і Ён выбавіць цябе.
23 Агіда для ГОСПАДА — неаднолькавыя вагі, і шалі падманлівыя — ня добра.
24 Ад ГОСПАДА крокі чалавека, і як жа чалавеку зразумець шлях свой?
25 Пастка для чалавека — пасьпешліва зрабіць шлюбаваньне, а пасьля абяцаньня разважаць.
26 Мудры валадар раскідае бязбожнікаў і зьверне на іх кола [малатарнае].
27 Сьветач ГОСПАДАЎ — дух чалавечы, ён дасьледуе ўсе сховы нутра.
28 Міласэрнасьць і праўда ахоўваюць валадара, і міласэрнасьцю ўмацоўваецца пасад ягоны.
29 Слава юнакоў — сіла іхняя, а веліч старых — сівізна.
30 Вытні і раны — лекавальная масьць, [якая пазбаўляе] ад ліхоты, і ўдары [ачышчаюць] глыбіню нутра.

Разьдзел 21

1 Сэрца валадара ў руцэ ГОСПАДА, як ручаі водаў; Ён скіроўвае яго, куды хоча.
2 Усе шляхі чалавека слушныя ў вачах ягоных, але ГОСПАД узважвае сэрцы.
3 Праведнасьць і суд даспадобы ГОСПАДУ больш, чым ахвяра.
4 Узьнесеныя вочы і надзьмутае сэрца — ніва бязбожнікаў, [і гэта] грэх.
5 Думкі руплівага [прыносяць] прыбытак, а кожны нецярплівы [будзе мець] нястачу.
6 Зьбіраньне скарбаў языком падманлівым — пара, што зьнікае, і шуканьне сьмерці.
7 Злачыннасьць бязбожнікаў зьвернецца на іх, бо яны грэбуюць чыніць суд [справядлівы].
8 Крывы шлях чалавека нягоднага, а справы чыстага — простыя.
9 Лепей жыць у куце на даху, чым са сварліваю жонкаю ў прасторным доме.
10 Душа бязбожніка жадае зла, ня знойдзе [ласкі] ў вачах ягоных бліжні яго.
11 Калі караюць насьмешніка, неразумны стаецца мудрэйшым, і калі мудрага вучаць, ён здабывае веданьне.
12 Разважае праведнік пра дом бязбожніка, як гінуць бязбожнікі ў ліхоцьці сваім.

13 Хто вушы свае затыкае на крык убогага, той сам будзе клікаць, але ня будзе адказу.
14 Падарунак таемны тушыць гнеў, а гасьцінец у заўлоньне [спыняе] вялікую ярасьць.
15 Правасудзьдзе — радасьць для праведніка і загуба для злачынцаў.
16 Чалавек, які зьбіваецца са шляху розуму, супачыне ў грамадзе памёршых.
17 Хто любіць весяліцца, будзе ў нястачы, а хто любіць віно і алей, ня будзе багатым.
18 Выкупам за праведніка [будзе] бязбожнік, а [выкупам] за правага — ліхадзей.
19 Лепш жыць у зямлі пустыннай, чым з жонкай гняўлівай і сварлівай.
20 Прывабныя скарбы і алей у жытле мудрага, а бязглузды чалавек змарнуе іх.
21 Хто імкнецца да праведнасьці і міласэрнасьці, знойдзе жыцьцё, праведнасьць і славу.
22 Мудры ўвойдзе ў горад магутных і зрыне моц, у якой яны мелі пэўнасьць.
23 Хто захоўвае вусны свае і язык свой, захоўвае душу сваю ад бедаў.
24 Свавольны і дзёрзкі, называны блюзьнерам, робіць усё ў шале нахабства.
25 Жаданьне гультая заб'е яго, бо рукі ягоныя адмаўляюцца працаваць.
26 Кожны дзень ён жадае і прагне, а праведнік дае і не шкадуе.
27 Ахвяра бязбожнікаў — брыдота, тым больш [брыдотныя] тыя, якія складаюць яе з падступнасьцю.
28 Сьведка хлусьлівы згіне, а чалавек, які слухае, будзе гаварыць заўсёды.
29 Чалавек бязбожны ўпарты абліччам сваім, а правы разумее шлях свой.
30 Няма мудрасьці, і няма розуму, і няма рады насуперак ГОСПАДУ.
31 Каня рыхтуюць на дзень бітвы, але перамога — ад ГОСПАДА.

Разьдзел 22

1 Лепш [добрае] імя, чым вялікія багацьці, лепш добрая слава, чым срэбра і золата.
2 Багаты і бедны сустракаюцца, Творца іх усіх — ГОСПАД.
3 Разумны бачыць зло і хаваецца, а неразумныя ідуць і будуць пакараныя.
4 [Нагарода] за пакору і страх перад ГОСПАДАМ — багацьце, і слава, і жыцьцё.
5 Церні і пасткі на шляху крывадушнага, а хто захоўвае душу сваю, той аддаляецца ад іх.
6 Пастаў юнака на слушны шлях, і ён ня збочыць з яго, нават калі састарэе.
7 Багаты пануе над бедным, і чалавек, які ўзяў пазыку, — слуга паверніка.
8 Хто сее беззаконьне, той будзе жаць ліха, і кій гневу ягонага будзе зьнішчаны.
9 Хто мае добрае вока, той будзе дабраслаўлёны, бо з хлеба свайго дае ўбогаму.
10 Выгані насьмешніка, і адыйдзе звадка, і суцішацца спрэчкі і абразы.
11 Хто любіць чыстасьць сэрца, у таго ласка на вуснах яго, і валадар з ім сябруе.
12 Вочы ГОСПАДА захоўваюць веданьне, Ён касуе словы ліхадзея.
13 Гультай кажа: «Леў на двары, пасярод плошчы я буду забіты».
14 Вусны чужаніцы — глыбокая яма; на каго загневаўся ГОСПАД, той уваліцца туды.
15 Дурасьць прывязаная да сэрца юнака, але дубец настаўленьня выганіць яе.
16 Хто ўціскае ўбогага, каб памножыць сваё, і дае багатаму, той згалее.
17 Прыхілі вуха тваё, і слухай словы мудрых, і сэрца тваё зьвярні да ведаў маіх,
18 бо цудоўна будзе, калі захаваеш іх у нутры тваім, і будуць яны таксама на вуснах тваіх,
19 каб пэўнасьць твая была ў ГОСПАДЗЕ, я вучу цябе сёньня.
20 Ці ж не пісаў я табе тройчы парады і навучаньні,
21 каб паведаміць табе дакладныя словы праўды, каб ты мог перадаць словы праўды тым, што паслалі цябе?
22 Не абдзірай убогага, таму што ён убогі, і не ўціскай прыгнечанага каля брамы,
23 бо ГОСПАД будзе бараніць у справе іхняй і адбярэ душу ў тых, якія іх абіраюць.
24 Не сябруй з васпанам гняўлівым і з чалавекам нястрыманым не хадзі,
25 каб ты не навучыўся сьцежкам яго і не нацягнуў пятлі на душу тваю.
26 Ня будзь з тых, што даюць руку, што заручаюцца за даўгі.

27 Калі ня маеш, чым заплаціць, навошта маюць забраць з-пад цябе ложак твой?
28 Не перасоўвай мяжы старадаўняй, якую вызначылі бацькі твае.
29 Ці бачыў ты чалавека, спраўнага ў занятку сваім? Перад абліччам валадароў ён будзе стаяць,
ня будзе ён стаяць перад прасьцякамі.

Разьдзел 23

1 Калі сядзеш есьці з вялікім панам, пільна зважай, што перад табою,
2 і прыстаў нож да горла твайго, калі прагавітая душа твая.
3 Ня квапся на прысмакі ягоныя, бо гэта падманлівы хлеб.
4 Не намагайся мець багацьце, пакінь разважаньні свае.
5 Зьвернеш вочы твае на яго, а яго няма, бо справіць яно крылы сабе і паляціць, як арол, аж у
неба.
6 Ня еш хлеб з зайздросным і ня квапся на прысмакі ягоныя,
7 бо якія думкі ў сэрцы ягоным, такі і ён. «Еш і пі», — кажа ён табе, але сэрца ягонае не з табою.
8 Кавалак, які ты зьеў, званітуеш, дарэмныя будуць салодкія словы твае.
9 Не гавары ў вушы дурня, бо ён узгардзіць разумнымі прамовамі тваімі.
10 Не перасоўвай мяжы старадаўняй і на поле сіротаў не ўваходзь,
11 бо дужы Абаронца іхні, і Ён будзе бараніць іх у судовай справе іхняй з табою.
12 Зьвярні сэрца тваё да настаўленьня, і вушы твае — да словаў веданьня.
13 Не пакідай юнака без настаўленьня, бо калі пакараеш яго дубцом, ён не памрэ.
14 Ты пакараеш яго дубцом і выратуеш душу ягоную ад пекла.
15 Сыне мой, калі мудрым будзе сэрца тваё, будзе радавацца з табою і маё сэрца.
16 І будуць цешыцца ныркі мае, калі на вуснах тваіх будуць словы правасьці.
17 Няхай сэрца тваё не зайздросьціць грэшнікам, але кожны дзень няхай будзе яно ў страху
перад ГОСПАДАМ,
18 бо ёсьць будучыня, і надзея твая не загіне.
19 Слухай, сыне мой, і будзь мудры, і скіроўвай сэрца тваё на шлях [просты].
20 Ня будзь сярод тых, што напіваюцца віна, сярод тых, што аб'ядаюцца мясам,
21 бо п'яніца і абжора зьбяднеюць, і заспанасьць апране ў лахманы.
22 Слухай бацьку твайго, які нарадзіў цябе, і не цурайся маці тваёй, калі яна састарэе.
23 Купляй праўду і не прадавай мудрасьці, настаўленьня і розуму.
24 Цешыцца і весяліцца бацька праведнага, і той, хто нарадзіў мудрага, радуецца з яго.
25 Няхай радуецца бацька твой, і тая, што нарадзіла цябе, няхай весяліцца.
26 Сыне мой, дай мне сэрца тваё, і няхай вачам тваім будуць даспадобы шляхі мае.
27 Бо распусьніца — яма глыбокая, і чужая [жонка] — цесны калодзеж.
28 Яна цікуе, быццам забойца, і памнажае ліхадзеяў паміж людзьмі.
29 У каго стогн? У каго гора? У каго сваркі? У каго смутак? У каго раны без прычыны? У каго
чырвоныя вочы?
30 У тых, якія доўга сядзяць пры віне, у тых, якія прыходзяць спрабаваць віна мяшанага.
31 Не глядзі на віно, як яно чырванее, як прамяніцца ў келіху, як роўненька ліецца.
32 У канцы яно ўкусіць, як зьмяя, і ўджаліць, як гадзіна.
33 Вочы твае будуць глядзець на чужых [жонак], і сэрца тваё загаворыць падступна.
34 І будзеш ты як той, што ляжыць пасярод мора, і як той, што ляжыць на версе мачты.
35 [І скажаш:] «Білі мяне, а я не адчуваў, штурхалі мяне, а я ня ведаў. Калі прачнуся, зноў буду
шукаць таго самага».

Разьдзел 24

1 Не зайздросьці людзям ліхім, не жадай быць з імі,
2 бо пра злачыннасьць думае сэрца іхняе, і пра ліхоту вусны іхнія гавораць.
3 Мудрасьцю будуецца дом, і розумам умацоўваецца,

4 і праз веданьне напаўняюцца пакоі яго ўсялякай каштоўнай і прывабнай маёмасьцю.
5 Мудры чалавек мае моц, і чалавек, які мае веды, умацоўвае сілу [сваю].
6 Таму з разважлівасьцю вядзі вайну тваю, і пры мностве дарадцаў — выратаваньне.
7 Занадта высокая мудрасьць для неразумнага, ён не раскрывае ў брамах вуснаў сваіх.
8 Хто задумляе рабіць ліхое, таго называюць зламысным.
9 Намеры бязглуздага — грэх, і [намеры] блюзьнера — агіда для чалавека.
10 Калі ты слабы ў дзень бедства, дык малая сіла твая.
11 Ратуй узятых на сьмерць, і ці ж не пашкадуеш тых, якія сказаныя на загубу?
12 Калі скажаш: «Вось, мы ня ведалі гэтага?», ці ж Той, Хто дасьледуе сэрцы, не разумее? Ці ж Той, Хто захоўвае душу тваю, ня ведае? Ці ж Ён не аддасьць чалавеку паводле справаў ягоных?
13 Еш мёд, сыне мой, бо ён добры, і соты салодкія для паднябеньня твайго.
14 Гэтак сама веданьне мудрасьці для душы тваёй. Калі ты знайшоў яе, ёсьць будучыня, і надзея твая не загіне.
15 Не цікуй, бязбожніку, каля жытла праведніка, не спусташай месца супачынку ягонага,
16 бо сем разоў упадзе праведнік і ўстане, а бязбожнікі трапяць у няшчасьце.
17 Ня радуйся, калі ўпадзе вораг твой, і няхай ня цешыцца сэрца тваё, калі ён спатыкнецца,
18 бо часам убачыць ГОСПАД, і будзе [гэта] ліхім у вачах Ягоных, і Ён адверне гнеў Свой ад яго.
19 Ня гневайся, [гледзячы] на ліхотнікаў і не зайздросьці бязбожнікам,
20 бо ня будзе будучыні ліхому, і сьветач бязбожнікаў стухне.
21 Бойся ГОСПАДА, сыне мой, і валадара, і ня зьвязвайся са змоўшчыкамі,
22 бо неспадзявана прыйдзе на іх загуба, і бедства ад іх абодвух хто можа ведаць.
23 Гэта таксама для мудрых: нядобра зважаць на аблічча ў судзе.
24 Таго, хто кажа бязбожніку: «Ты праведны», будуць праклінаць народы і будуць брыдзіцца ім людзі.
25 А тымі, што дакараюць, будуць захапляцца, і зыйдзе на іх шчодрае дабраславенства.
26 У вусны цалуе той, хто адказвае шчырымі словамі.
27 Выканай працу тваю звонку [дому] і скончы яе на полі тваім, а пасьля пабудуй дом твой.
28 Ня сьведчы без прычыны супраць бліжняга твайго, і не падманвай вуснамі тваімі.
29 Не кажы: «Як ён мне зрабіў, так і я зраблю яму, аддам чалавеку паводле справаў яго».
30 Праходзіў я праз поле гультая і праз вінаградник чалавека бяз розуму,
31 і вось, усё зарасло асотам, і крапіва пакрыла паверхню яго, і каменная агароджа зруйнаваная.
32 І паглядзеў я, і зьвярнуў [на гэта] сэрца маё, убачыў, і атрымаў настаўленьне:
33 «Крыху пасьпіш, крыху падрэміш, крыху, склаўшы рукі, паляжыш.
34 і прыйдзе, як валацуга, беднасьць твая, і нястача твая — як чалавек узброены».

Разьдзел 25

1 Гэта таксама прыповесьці Салямона, сабраныя людзьмі Эзэкіі, валадара Юды.
2 Слава Божая — утоіць справу, а слава валадароў — дасьледаваць справу.
3 Высокасьць неба, глыбокасьць зямлі і сэрца валадароў недасьледныя.
4 Аддзялі жужаль ад срэбра, і выйдзе ў майстра начыньне.
5 Прыбяры бязбожніка ад аблічча валадара, і пасад ягоны ўмацуецца праведнасьцю.
6 Не ўзьвялічвай сябе перад абліччам валадара і на месцы вялікіх ня стой,
7 бо лепш, калі скажуць табе: «Узьніміся вышэй», чым калі панізяць цябе перад абліччам магната, якога бачылі вочы твае.
8 Не кідайся пасьпешліва судзіцца, бо што зробіш у канцы, калі асароміць цябе бліжні твой.
9 Вядзі спрэчку з бліжнім тваім і не выяўляй таямніцу іншага,
10 каб той, хто пачуе, не ўпікнуў цябе, і каб не зьвярнулася [супраць] цябе гаворка твая.
11 Як залатыя яблыкі са срэбнымі ўпрыгожваньнямі, так слова, сказанае дарэчы.

12 Як залатыя завушніцы і аздоба са шчырага золата, так мудрае дакараньне для ўважлівага
вуха.
13 Як прахалода сьнегу ў дзень жніва, так верны пасланец для таго, хто паслаў яго, ён ажыўляе
душу гаспадара свайго.
14 Як хмары і вецер без дажджу, так чалавек, які хваліцца падарункам фальшывым.
15 Цярплівасьцю пераканаеш начальніка, і лагодны язык ломіць костку.
16 [Як] знайшоў мёд, еш, колькі трэба табе, каб ты не пераеў і не званітаваў.
17 Стрымай нагу тваю ад дому бліжняга твайго, каб ты не надакучыў яму і каб ён не
ўзьненавідзеў цябе.
18 Як мачуга, меч і вострая страла, так чалавек, які кажа фальшывае сьведчаньне супраць
бліжняга свайго.
19 Як гнілы зуб і кульгавая нага, так надзея на ліхадзея ў дзень бедства.
20 Як здымаць адзеньне ў халодны дзень, як [ліць] воцат на салетру, так сьпяваць песьні
засмучанаму сэрцу.
21 Калі ненавісьнік твой галодны, накармі яго хлебам, калі смагне, напаі яго вадою,
22 бо гэтым вугольле зьбіраеш на галаву ягоную, і ГОСПАД аднагародзіць табе.
23 Паўночны вецер прыганяе дождж, а язык абмоўніка [прыносіць] гнеў на тварах.
24 Лепей жыць у куце на даху, чым са сварліваю жонкаю ў прасторным доме.
25 Як халодная вада для стомленай душы, так добрыя весткі з далёкага краю.
26 Як скаламучанае жарало і зьнішчаная крыніца, так праведнік, які падае перад бязбожнікам.
27 Як нядобра есьці шмат мёду, так дамагацца сваёй славы ня ёсьць слава.
28 Як горад зруйнаваны і без муроў, так чалавек, які не валодае духам сваім.

Разьдзел 26

1 Як сьнег улетку, а дождж у жніво, так дурню не пасуе слава.
2 Як птушка пераляціць і як ластаўка паляціць, так праклён беспрычынны ня збудзецца.
3 Пуга — для каня, аброць — для асла, а кій — на сьпіну дурня.
4 Не адказвай дурню паводле дурасьці ягонай, каб ня стаўся ты падобным да яго.
5 Адказвай дурню паводле дурасьці ягонай, каб ня стаўся ён мудрым у вачах сваіх.
6 Падцінае сабе ногі і п'е шкоду сваю той, хто праз рукі дурня слова пасылае.
7 Няроўныя ногі кульгавага, таксама прыказка ў вуснах дурня.
8 Як прывязваць камень да вяроўкі, так аддаваць пашану дурню.
9 Як калючка ў руцэ п'янага, так прыказка ў вуснах дурня.
10 Вяльможны робіць усё: і дурня наймае, і мінака наймае.
11 Як сабака вяртаецца да ванітаў сваіх, так дурань паўтарае дурасьць сваю.
12 Ці бачыў ты чалавека, мудрага ў вачах сваіх? На дурня большая надзея, чым на такога.
13 Гультай кажа: «Леў на шляху! Леў на плошчы!»
14 Дзьверы варочаюцца на завесах сваіх, а гультай — на ложку сваім.
15 Гультай хавае руку сваю ў місе, і яму цяжка падняць яе да вуснаў сваіх.
16 Гультай мудрэйшы ў вачах сваіх за сямёх, што адказваюць з разуменьнем.
17 Хапае сабаку за вушы той, хто мяшаецца ў чужую спрэчку.
18 Як вар'ят, які кідае агонь, стрэлы і сьмерць,
19 так чалавек, які падманвае бліжняга свайго і кажа: «Гэта я жартую».
20 Калі няма дроваў, агонь гасьне, калі няма пляткара, звадка сьціхае.
21 Вугаль — для жару, дровы — для агню, а чалавек сварлівы — для распальваньня спрэчкі.
22 Словы пляткара — як прысмакі, яны зыходзяць у глыб нутра.
23 Як гліна, паліваная срэбрам з жужалем, так гарачыя вусны і ліхое сэрца.
24 Ненавісьнік прыкрываецца вуснамі сваімі, а ў нутры сваім рыхтуе ашуканства.
25 Калі ён робіць лагодным голас свой, ня вер яму, бо сем брыдотаў у сэрцы ягоным.
26 [Чыя] нянавісьць прыхоўваецца ашуканствам, таго ліхота выявіцца перад грамадою.

27 Хто капае яму, той уваліцца ў яе, і хто пакоціць камень, на таго ён вернецца.
28 Брахлівы язык ненавідзіць пакрыўджаных ім, і вусны лісьлівыя вядуць да загубы.

Разьдзел 27

1 Не хваліся заўтрашнім днём, бо ня ведаеш, што гэты дзень народзіць.
2 Няхай іншы хваліць цябе, а ня вусны твае, нехта чужы, а ня губы твае.
3 Камень цяжкі і пясок важкі, але гнеў неразумнага цяжэйшы за іх абодвух.
4 Гнеў нястрымны і ярасьць бязьлітасная, але хто ўстаіць перад рэўнасьцю?
5 Лепш адкрытае дакараньне, чым схаваная любоў.
6 Раны ад таго, хто любіць, [выказваюць] вернасьць [ягоную], а пацалункі ненавісьніка шматлікія.
7 Душа насычаная топчацца па мёдзе, а душы галоднай усё горкае салодкае.
8 Як птушка, што пакінула гняздо сваё, так чалавек, які пакідае месца сваё.
9 Алей і кадзіла радуюць сэрца, а салодкасьць бліжняга — у парадзе ад душы.
10 Не пакідай бліжняга твайго і бліжняга бацькі твайго, і ў дом брата твайго не хадзі ў дзень няшчасьця твайго, бо лепш сусед блізка, чым брат далёка.
11 Будзь мудры, сыне мой, і ўзрадуй сэрца маё, каб мог я адказаць таму, хто зьневажае мяне.
12 Разумны бачыць зло і хаваецца, а неразумныя ідуць і будуць пакараныя.
13 Забяры адзеньне яго, бо ён паручыўся за чужога, і за чужынца вазьмі заклад ад яго.
14 Таму, хто рана раніцаю гучным голасам дабраслаўляе бліжняга свайго, палічаць гэта за праклён.
15 Няспыннае капаньне [праз дах] у дажджлівы дзень і сварлівая жонка — аднолькавыя.
16 Хто [спрабуе] схаваць яе, хавае вецер і пахкі алей у правай руцэ сваёй, які выдае сябе.
17 Жалеза жалезам вострыцца, а чалавек вострыць аблічча бліжняга свайго.
18 Хто даглядае дрэва фігавае, будзе есьці плады яго, а хто пільнуецца гаспадара свайго, будзе ў пашане.
19 Як у вадзе аблічча да аблічча, так сэрца чалавека — да чалавека.
20 Адхлань і пекла ненасытныя, і вочы чалавека ненасытныя.
21 Літавальны гаршчок для срэбра і горан для золата, а для чалавека — вусны, якія хваляць яго.
22 Хоць будзеш таўчы неразумнага таўкачом паміж зерня ў ступе, дурнота ягоная не адыйдзе ад яго.
23 Ведай добра авечак тваіх, зьвяртай сэрца тваё да статкаў тваіх,
24 бо багацьце ня вечнае, і ці ж дыядэма [перадаецца] з пакаленьня ў пакаленьне?
25 Вырастае трава, і зьяўляецца зеляніна, і зьбіраюць сена з гораў.
26 Ягняты — на вопратку табе, і казлы — плата за поле.
27 І досыць казінага малака на ежу табе, і на ежу дому твайму, і на жыцьцё для служак тваіх.

Разьдзел 28

1 Бязбожнік бяжыць, хоць ніхто не перасьледуе яго, а праведнікі ўпэўненыя, як ільвы.
2 Дзеля правінаў зямлі шмат у ёй начальнікаў, а праз чалавека, які ведае і разважае, яна даўгавечная.
3 Чалавек бедны, які ўціскае ўбогіх, як залеўны дождж, [што пакідае] бяз хлеба.
4 Хто адступаецца ад закону, той хваліць бязбожніка, а хто захоўвае закон, той паўстае супраць [ліхадзея].
5 Ліхія людзі не разумеюць суду, а тыя, што шукаюць ГОСПАДА, разумеюць усё.
6 Лепш бедны, які ходзіць у беззаганнасьці сваёй, чым той, які крывіць шляхі свае, дарма што багаты.
7 Сын разумны захоўвае закон, а той, хто сябруе з абжорамі, сароміць бацьку свайго.
8 Хто памнажае маёмасьць сваю адсоткам і ліхвай, той зьбірае яе для таго, хто літуецца над убогім.
9 Хто адварочвае вуха сваё, каб ня чуць закону, таго малітва — брыдота.

10 Хто схіляе правых на шлях зла, сам уваліцца ў яму сваю, а беззаганныя атрымаюць у
спадчыну добрае.
11 Мудры ў вачах сваіх чалавек багаты, але ўбогі, які мае розум, выспрабуе яго.
12 Калі праведнікі перамагаюць — вялікая слава, а калі ўздымаюцца бязбожнікі, чалавек
хаваецца.
13 Той, хто хавае свае правіны, ня будзе мець посьпеху, а хто прызнаецца і пакідае іх, дазнае
міласэрнасьці.
14 Шчасьлівы чалавек, які мае трымценьне заўсёды, а хто робіць цьвёрдым сэрца сваё, трапіць
у бяду.
15 Леў рыклівы і мядзьведзь бадзяжны — [гэта] бязбожны пан над бедным народам.
16 Правадыр, пазбаўлены розуму, робіць шмат крыўды, а хто ненавідзіць хцівасьць,
прадоўжыць дні свае.
17 Чалавек, абцяжараны крывёю душы [другога], будзе бегаць да магілы, і ніхто не падтрымае
яго.
18 Хто ходзіць беззаганна, будзе ўратаваны, а крывадушны на шляхах [сваіх] упадзе на адным
[з іх].
19 Хто абрабляе зямлю сваю, насыціцца хлебам, а хто гоніцца за марнасьцю, насыціцца
беднасьцю.
20 Чалавек верны мае шмат дабраславенстваў, а хто сьпяшаецца ўзбагацець, не пазьбегне
пакараньня.
21 Нядобра зважаць на аблічча, бо дзеля кавалку хлеба чалавек робіць беззаконьне.
22 Сьпяшаецца да багацьця чалавек ліхога вока і ня ведае, што нястача прыйдзе на яго.
23 Той, хто дакарае чалавека, знойдзе пасьля [большую] ласку, чым той, хто языком лісьлівіць.
24 Хто абкрадае бацьку свайго і маці сваю і кажа: «Няма тут віны», той супольнік нішчыцелю.
25 Душа надзьмутая ўзьнімае звадку, а хто спадзяецца на ГОСПАДА, будзе насычаны.
26 Хто спадзяецца на сэрца сваё, той дурань, а хто ходзіць у мудрасьці, будзе збаўлены.
27 Хто дае бедным, ня будзе мець нястачы, а хто хавае вочы свае, мецьме шмат праклёнаў.
28 Калі бязбожнікі ўздымаюцца, людзі хаваюцца, а калі яны гінуць, памнажаюцца праведнікі.

Разьдзел 29

1 Чалавек, які на дакараньне робіць цьвёрдым карак свой, раптоўна будзе зьнішчаны, і ня будзе
аздараўленьня.
2 Калі памнажаюцца праведнікі, радуецца народ, а калі пануе бязбожнік, народ стогне.
3 Чалавек, які любіць мудрасьць, радуе бацьку свайго, а той, які сябруе з распусьніцамі,
распускае маёмасьць.
4 Валадар правасудзьдзем умацоўвае зямлю, а чалавек, які [любіць] дары, руйнуе яе.
5 Чалавек, які лісьлівіць бліжняму свайму, стаўляе сетку нагам ягоным.
6 У злачынстве ліхога чалавека пастка [для яго], а праведнік сьпявае і радуецца.
7 Праведнік ведае справу ўбогіх, а бязбожнік і ня думае ведаць [яе].
8 Блюзьнеры ўзбураюць горад, а мудрыя ўтаймоўваюць гнеў.
9 Мудры чалавек, судзячыся з неразумным, і злуецца, і сьмяецца, і ня мае спакою.
10 Людзі крывавыя ненавідзяць беззаганнага, а правыя дбаюць пра душу ягоную.
11 Дурань выяўляе ўвесь свой дух, а мудры затрымлівае яго на пазьней.
12 Калі пан зважае на словы фальшывыя, тады бязбожныя ўсе, што служаць яму.
13 Бядак і прыгнятальнік сустракаюцца, сьвятло вачам іх абодвух дае ГОСПАД.
14 Валадар, які судзіць убогіх паводле праўды, умацуе пасад свой на вякі.
15 Дубец і дакор даюць мудрасьць, а дзіцё, пакінутае [само сабе], — сорам для маці яго.
16 Калі памнажаюцца бязбожнікі, памнажаюцца злачынствы, але праведнікі ўбачаць
падзеньне іх.
17 Карай сына твайго, і ён дасьць табе супачыць, і дасьць асалоду для душы тваёй.
18 Без [прароцкага] відзежу народ неакелзаны, а хто захоўвае закон, той шчасьлівы.

19 Словамі ня будзе настаўлены слуга, бо хоць зразумее, але ня дасьць адказу.
20 Ці бачыў ты чалавека, хуткага на словы? На дурня большая надзея, чым на такога.
21 Калі з маленства песьціць слугу свайго, урэшце, той станецца гаспадаром.
22 Гняўлівы чалавек усчынае звадку, а раз'юшаны [ўчыняе] багата правінаў.
23 Пыха чалавека прыніжае яго, а пакорлівы духам здабудзе славу.
24 Хто супольнічае са злодзеем, ненавідзіць душу сваю, ён чуе праклёны, але не выяўляе [гэтага].
25 Страх перад чалавекам стаўляе пастку, а хто спадзяецца на ГОСПАДА, будзе ў бясьпецы.
26 Шмат хто шукае аблічча пана, але ГОСПАД судзіць чалавека.
27 Агіда для праведнікаў — чалавек беззаконны, а для бязбожніка агідны той, што [ідзе] простым шляхам. м.

Разьдзел 30

1 Словы Агура, сына Якэ, выслоўі, якія сказаў чалавек гэты да Ітыэля, да Ітыэля і Укаля:
2 Бо я найдурнейшы між людзей, і розуму чалавечага няма ў мяне,
3 не навучыўся я мудрасьці і ведаў сьвятых ня ведаю.
4 Хто ўзыходзіў на неба і зыходзіў? Хто сабраў вецер у жменю сваю? Хто зьвязаў воды ў адзежу? Хто ўмацаваў усе канцы зямлі? Якое імя яго і якое імя сына ягонага, ці ведаеш ты?
5 Усе словы Бога чыстыя [ад дамешкаў], Ён — шчыт для тых, што маюць у Ім надзею.
6 Не дадавай да словаў Ягоных, каб Ён ня выкрыў цябе і ня стаўся ты падманшчыкам.
7 Дзьве рэчы прашу ў Цябе, не адмаўляй мне перш, чым памру:
8 марнасьць і слова хлусьлівае аддалі ад мяне, ані беднасьці, ані багацьця не давай мне, сыць мяне хлебам, вызначаным для мяне,
9 каб я, насыціўшыся, ня выракся Цябе і не сказаў: «Хто ГОСПАД?», або каб, зьбяднеўшы, ня стаў красьці і ганьбіць імя Бога майго.
10 Не ачарняй слугі перад гаспадаром ягоным, каб ён не пракляў цябе і ты ня стаўся вінаватым.
11 [Ёсьць] пакаленьне, якое праклінае бацьку свайго і не дабраслаўляе маці сваю,
12 пакаленьне, якое чыстае ў вачах сваіх, але не абмытае ад бруду свайго,
13 пакаленьне, у якога пыхлівыя вочы і павекі ўзьнятыя,
14 пакаленьне, у якога зубы — мячы, а сківіцы — нажы, каб есьці ўцісканых на зямлі і гаротных між людзей.
15 У п'яўкі дзьве дачкі: «давай» і «давай». Вось тры ненасытныя і чатыры, якія ня скажуць: «Досыць»:
16 адхлань і чэрава няплоднае, зямля, якая не насычаецца вадою, і агонь, які ня кажа: «Досыць».
17 Вока, якое зьдзекуецца з бацькі і пагарджае паслухмянасьцю маці, выдзяўбуць груганы над ракою і зьядуць арляняты.
18 Вось тры [рэчы], дзівосныя для мяне, і чатырох не разумею:
19 шляху арла ў небе, шляху зьмяі на скале, шляху карабля сярод мора і шляху мужчыны да дзяўчыны.
20 Такі самы шлях жанчыны чужаложнай: зьела, абцёрла вусны свае і кажа: «Я не зрабіла благога».
21 Дзеля трох трасецца зямля, і чатырох яна зьнесьці ня можа:
22 слугі, калі ён валадарыць, бязглуздага, калі ён насычаецца хлебам,
23 ганебнай жанчыны, калі яна замуж выходзіць, і нявольніцы, калі яна спадкуе па гаспадыні сваёй.
24 Вось чатыры малыя на зямлі, але яны мудрэйшыя за мудрых:
25 мурашкі — народ ня моцны, але летам назапашваюць хлеб свой,
26 даманы — народ не магутны, але стаўляюць дамы свае на скале,
27 няма валадара ў саранчы, але ўсе выходзяць шыхтавана,
28 павук лапкамі чапляецца, але вось, ён у палацы валадара.

29 Вось трое крочаць паважна, і чацьвёра паважна ходзяць:
30 леў, магутнейшы між зьвярамі, ні перад кім не саступае,
31 конь асядланы, і казёл, і валадар, супраць якога ніхто не паўстане.
32 Калі вывышаешся бяздумна або калі задумаў ліхое, [палажы] руку сваю на вусны.
33 Бо хто зьбівае малако, атрымае масла, і хто ўдарыць у нос, атрымае кроў, а хто выклікае гнеў, атрымае сварку.

Разьдзел 31

1 Словы Лемуэля, валадара, выслоўі, якім навучыла яго маці ягоная.
2 Што, сыне мой? Што, сыне жывата майго? Што, сыне абяцаньняў маіх?
3 Не давай жанчынам сілы тваёй, ані шляхоў тваіх нішчыцелькам валадароў.
4 Не валадарам, Лемуэлю, не валадарам піць віно, і не князям — сікеру,
5 каб не напіліся і не забыліся яны на напісанае, і каб не скрывілі суд для ўсіх прыгнечаных.
6 Дайце сікеру таму, хто гіне, а віно — засмучаным душою.
7 Няхай вып'е такі і забудзецца на бядоту сваю, і ня памятае больш цяжару свайго.
8 Адчыні вусны твае дзеля нямых, дзеля абароны ўсіх сіротаў.
9 Адчыні вусны твае, судзі праведна, абараняй прыгнечанага і беднага.
10 Хто знойдзе жонку дабрадзейную? Яна даражэй за пэрліны.
11 Пэўнае ў ёй сэрца мужа яе, і ён не застанецца без прыбытку.
12 Яна дае яму дабро, а ня зло, у-ва ўсе дні жыцьця свайго.
13 Шукае яна воўну і лён, і ахвотна працуе рукамі сваімі.
14 Яна падобная да караблёў купецкіх, здалёк прыносіць хлеб свой.
15 І ўстае яна сярод ночы, і раздае ежу ў доме сваім, і належнае служкам сваім.
16 Падумае яна пра поле, і купляе яго, з плоду рук сваіх закладае вінаграднік.
17 Яна падпярэзвае моцаю сьцёгны свае і ўмацоўвае рамёны свае.
18 Яна адчувае, што добры занятак яе, і сьветач яе ня тухне і ўначы.
19 Працягвае рукі свае да кудзелі, а далоні яе трымаюць верацяно.
20 Далоні свае адкрывае прыгнечанаму, і руку сваю працягвае беднаму.
21 Не баіцца сьцюжы для дому свайго, бо ўвесь дом яе ў кармазын апрануты.
22 Дываны яна робіць сабе, вісон і пурпур — адзеньне яе.
23 У брамах [гораду] вядомы муж ейны, калі сядзіць сярод старшыняў зямлі.
24 Робіць яна палатніну, і продае яе, і дастаўляе паясы купцам Хананейскім.
25 Сіла і велічнасьць — адзеньне яе, і радуецца яна дню, што прыходзіць.
26 Яна адкрывае вусны свае з мудрасьцю, і міласэрнае настаўленьне на языку ў яе.
27 Яна пільнуе шэсьце дому свайго і ня есьць хлеба гультайства.
28 Устаюць дзеці ейныя, і называюць шчасьлівай яе, і муж ейны хваліць яе:
29 «Шмат было жанчынаў дабрадзейных, але ты пераўзыйшла іх усіх!»
30 Прывабнасьць падманлівая і прыгажосьць марная, але жанчына, якая баіцца ГОСПАДА, годная пахвалы.
31 Дайце ёй з пладоў рук ейных, і няхай справы яе ў брамах [гораду] хваляць яе.

КНІГА ЭКЛЕЗІЯСТА

1 Слова Эклезіяста, сына Давіда, валадара ў Ерусаліме.
2 Марнасьць марнасьцяў, сказаў Эклезіяст, марнасьць марнасьцяў, усё — марнасьць.
3 Якая карысьць чалавеку з усёй цяжкай працы ягонай, якую ён робіць пад сонцам?
4 Пакаленьне адыходзіць і пакаленьне прыходзіць, а зямля на вякі трывае.
5 Узыйшло сонца, і зайшло сонца, і сьпяшаецца на месца сваё, дзе яно ўзыходзіць.
6 Вецер ідзе на поўдзень і паварочвае на поўнач, кружляючы, кружляе, дзьме вецер і вяртаецца вецер на кружэньне сваё.
7 Усе рэкі цякуць у мора, і мора не перапаўняецца; да месца, з якога рэкі цякуць, вяртаюцца яны, каб [зноў] адтуль выцякаць.
8 Усе словы стамляюць, ня можа чалавек выказаць [усяго]. Не насыціцца вока гляджэньнем, і не напоўніцца вуха слуханьнем.
9 Што было, тое і будзе, а што рабілася, тое і будзе рабіцца, і няма нічога новага пад сонцам.
10 Бывае рэч, пра якую кажуць: “Глядзі, вось гэта новае”, але гэта было ўжо ў вяках, што былі перад намі.
11 Няма памяці пра тых, што раней жылі, і таксама пра тых, што потым жыць будуць, ня будзе памяці ў тых, якія будуць пасьля іх.
12 Я, Эклезіяст, быў валадаром Ізраіля ў Ерусаліме.
13 І аддаў я сэрца маё, каб шукаць і дасьледаваць з мудрасьцю ўсё, што дзеецца пад небам. Гэты кепскі занятак даў Бог сынам чалавечым, каб былі занятыя ім.
14 Глядзеў я на ўсе справы, якія робяцца пад сонцам; і вось, усё — марнасьць і пагоня за ветрам.
15 Крывое ня можна зрабіць простым, і тое, чаго няма, нельга палічыць.
16 Сказаў я ў сэрцы маім, кажучы: “Вось, я ўзьвялічыўся і прыдбаў мудрасьці больш за ўсіх, што былі раней за мяне ў Ерусаліме; і сэрца маё ўбачыла шмат мудрасьці і веданьня”.
17 І аддаў я сэрца маё, каб пазнаць мудрасьць і пазнаць шаленства і глупоту; і спазнаў, што і гэта — турбаваньне духа.
18 Бо з вялікай мудрасьці шмат смутку, і хто павялічвае веданьне, павялічвае боль.

Экл 2

1 Сказаў я ў сэрцы маім: “Вось жа цяпер паспрабую радасьць і пагляджу на тое, што добрае”, але гэта таксама марнасьць.
2 Пра сьмех сказаў я: “Шаленства!”, і пра радасьць: “Што яна зробіць?”
3 Вырашыў я ў сэрцы маім дазволіць целу майму віно, але каб сэрца маё кіравалася мудрасьцю, і трымацца глупоты, аж пакуль ня ўбачу, што добра для сыноў чалавечых, каб рабіць пад сонцам у палічаных днях жыцьця свайго.
4 Я павялічыў справы свае: пабудаваў сабе дамы і пасадзіў для сябе вінаграднікі,
5 залажыў для сябе сады і гаі, і пасадзіў у іх усялякіх дрэваў пладовых,
6 і зрабіў сабе сажалкі з вадою, каб напойваць лес, у якім растуць дрэвы.
7 Я набыў нявольнікаў і нявольніц, і чэлядзь была ў мяне, таксама статкі валоў і чароды авечак былі ў мяне большыя, чым у-ва ўсіх, што былі раней за мяне ў Ерусаліме.
8 Я назьбіраў сабе таксама срэбра і золата, і каштоўнасьці валадароў і акругаў; завёў сьпевакоў і сьпявачак, і асалоду сыноў чалавечых, мноства наложніцаў.
9 І зрабіўся я вялікшым і заможнейшым за ўсіх, якія былі раней за мяне ў Ерусаліме; а мудрасьць мая была са мною.
10 І ўсё, чаго жадалі вочы мае, я не адмаўляў ім, і не забараняў сэрцу свайму ніякай радасьці, бо сэрца маё радавалася з усёй цяжкай працы маёй, і гэта была доля мая ў-ва ўсёй цяжкай працы маёй.
11 І азірнуўся я на ўсе справы свае, якія зрабілі рукі мае, і на цяжкую працу маю, якую рабіў, працуючы, і вось, усё — марнасьць і пагоня за ветрам, і няма карысьці з гэтага пад сонцам.

12 І азірнуўся я, каб паглядзець на мудрасьць, і шаленства, і глупоту, бо што можа зрабіць
чалавек, які прыйдзе пасьля валадара, звыш таго, што раней рабілася.
13 І ўбачыў я, што з мудрасьці большая карысьць, чым з глупоты, падобна як карысьць са
сьвятла большая, чым з цемры.
14 Мудры [мае] вочы свае ў галаве сваёй, а дурань ходзіць у цемры. І пазнаў я таксама, што тая
самая доля спаткае іх усіх.
15 І сказаў я ў сэрцы маім: “Калі адна доля будзе для мяне і для дурня, навошта мне вялікая
мудрасьць?” І сказаў я ў сэрцы маім: “Гэта таксама марнасьць”.
16 Бо ня будзе на вякі памяці пра мудрага, як і пра дурня. Тое, што цяпер ёсьць, у дні наступныя
ўсё забудзецца, і мудры памірае гэтак сама, як і дурань.
17 І зьненавідзеў я жыцьцё, бо ліхімі былі для мяне справы, што робяцца пад сонцам; бо ўсё —
марнасьць і пагоня за ветрам.
18 І зьненавідзеў я ўсю цяжкую працу маю, якой працаваў пад сонцам, якую мушу пакінуць
чалавеку, які будзе пасьля мяне.
19 І хто ведае, ці мудрым ён будзе, ці неразумным? А ён будзе панаваць над [пладамі] ўсёй
цяжкай працы маёй, дзеля якіх я працаваў і якія мудрасьцю зьбіраў пад сонцам. І гэта таксама
марнасьць.
20 І павярнуўся я, каб адцурацца сэрцу майму ад усёй цяжкай працы, якой я працаваў пад
сонцам.
21 Бо ёсьць так, што чалавек, які працуе з мудрасьцю, і з веданьнем, і пасьпяхова, аддае
набытак свой чалавеку, які не працаваў над гэтым. І гэта таксама марнасьць і вялікае зло.
22 Бо што будзе мець чалавек з усёй цяжкай працы сваёй і турбаваньняў сэрца свайго, якімі ён
спрацаваны пад сонцам?
23 Бо ўсе дні ягоныя — боль, і занятак ягоны — смутак, нават уначы не адпачывае сэрца ягонае.
І гэта таксама марнасьць.
24 Няма нічога лепшага чалавеку, як есьці і піць, і даваць душы сваёй [карыстацца] дабром
цяжкай працы сваёй. Таксама ўбачыў я, што гэта з рукі Божай [паходзіць].
25 Бо хто еў і хто пасьпяшаўся [мець усё] так, як я?
26 Бо чалавеку, які добры перад абліччам Ягоным, Ён дае мудрасьць, і веданьне, і радасьць,
а грэшніку дае занятак, каб зьбіраў, і назапашваў, і [потым] аддаў таму, хто добры перад
абліччам Божым. І гэта таксама марнасьць і пагоня за ветрам.

Экл 3

1 Для ўсяго ёсьць свой тэрмін, і час для кожнай рэчы пад небам;
2 Час нараджацца і час паміраць, час садзіць і час вырываць тое, што пасаджана.
3 Час забіваць і час лекаваць, час разбураць і час будаваць.
4 Час плакаць і час сьмяяцца, час галасіць і час танчыць.
5 Час кідаць камяні і час зьбіраць камяні, час абдымаць і час пазьбягаць абдымкаў.
6 Час шукаць і час губляць, час захоўваць і час пакідаць.
7 Час разьдзіраць і час сшываць, час маўчаць і час гаварыць.
8 Час любіць і час ненавідзець, час вайны і час міру.
9 Што за карысьць мае з працы сваёй той, хто працуе?
10 І я ўбачыў занятак, які даў Бог сынам чалавечым, каб яны займаліся ім.
11 Усё Ён зрабіў прыгожым у свой час; і даў ім вечнасьць у сэрца, аднак чалавек не спасьцігне
справаў, якія робіць Бог, ад пачатку аж да канца.
12 І даведаўся я, што няма для іх нічога лепшага, як весяліцца і рабіць добрае ў жыцьці сваім.
13 І тое, што кожны чалавек есьць і п’е, і бачыць добрае з усёй цяжкай працы сваёй, — гэта дар
Божы.
14 І даведаўся я, што ўсё, што робіць Бог, трывае на вякі; нельга да таго дадаць і нельга ад таго
адняць, і Бог робіць так, каб баяліся аблічча Яго.
15 Тое, што было, цяпер ёсьць, і тое, што мае быць, ужо было, і Бог знаходзіць тое, што
прамінула.

16 І яшчэ бачыў я пад сонцам: месца суду, а там беззаконьне, месца праведнасьці, а там
няправасьць.
17 Сказаў я ў сэрцы маім: “Праведніка і бязбожніка будзе судзіць Бог, бо там ёсьць час на
кожную рэч і на кожную справу”.
18 Сказаў я ў сэрцы маім пра сыноў чалавечых, што Бог ачышчае іх і паказвае, што яны самі па
сабе — як тая жывёла.
19 Бо доля сыноў чалавечых і доля жывёлы — аднолькавая доля; як тыя паміраюць, так і гэтыя
паміраюць, і дух [жыцьця] аднолькавы для ўсіх, і няма ў чалавека перавагі над жывёлаю, бо
ўсё — марнасьць.
20 Усё ідзе ў адно месца, усё з пылу паўстала, і ўсё ў пыл вяртаецца.
21 Хто ведае, ці дух сыноў чалавечых узыходзіць угору, ці дух жывёлы зыходзіць уніз, у зямлю?
22 І ўбачыў я, што нічога няма лепшага для чалавека, як радавацца са справаў сваіх, бо гэта
доля ягоная. Бо хто прывядзе яго паглядзець на тое, што будзе пасьля яго?

Экл 4

1 І я павярнуўся, і ўбачыў усякі прыгнёт, які робіцца пад сонцам, і вось, слёзы прыгнечаных, і
няма для іх суцяшэньня; і ў руцэ прыгнятальнікаў — сіла, і няма для іх суцяшэньня.
2 І я больш пахваліў памёршых, якія ўжо памерлі, чым жывых, якія яшчэ жывуць.
3 А лепшы за іх абодвух той, якога яшчэ няма, які ня бачыў ліхія справы, што робяцца пад
сонцам.
4 І ўбачыў я, што кожная цяжкая праца і кожны посьпех у справах выклікае зайздрасьць да
чалавека ў бліжняга [ягонага]. Гэта таксама марнасьць і пагоня за ветрам.
5 Дурань складвае рукі свае і зьядае цела сваё.
6 Лепшая адна поўная жменя са спакоем, чым абедзьве жмені напоўненыя, а з імі цяжкая
праца і пагоня за ветрам.
7 І я павярнуўся, і ўбачыў марнасьць пад сонцам.
8 [Чалавек] адзін, і няма другога, таксама няма ані сына, ані брата ў яго, і няма канца ўсёй
цяжкай працы ягонай, і вока ягонае не насычаецца багацьцем, [і кажа ён:] “Для каго я працую
і пазбаўляю душу сваю дабра?” Гэта таксама марнасьць і кепскі занятак.
9 Лепш двум, чым аднаму, таму што маюць добрую ўзнагароду за цяжкую працу сваю.
10 Бо калі адзін упадзе, другі падыме таварыша свайго. Але гора аднаму, як ён упадзе, і няма
другога, каб падняць яго.
11 Таксама, калі ляжаць двое, будзе цёпла ім; а як адзін можа сагрэцца?
12 І, калі хто зможа перамагчы аднаго, дык двое супрацьстануць яму, і вяроўка патройная ня
хутка парвецца.
13 Лепш хлопец бедны і мудры, чым валадар стары і дурны, які ня можа ўжо прыймаць парады.
14 Бо той выходзіць з вязьніцы, каб валадарыць, а гэты ў валадарстве сваім можа стаць
бедаком.
15 І я бачыў усіх, хто жыве і ходзіць пад сонцам, з тым хлопцам, другім, які стане на месца
ягонае.
16 Няма канца ўсяму народу, усім, якія былі перад ім, але тыя, што пасьля будуць, ня будуць
радавацца дзеля яго. І гэта таксама марнасьць і турбаваньне духа.
17 Захоўвай ногі свае, калі ідзеш у Дом Божы, і набліжайся туды, каб слухаць, а не складаць
ахвяры як дурні, бо яны ня маюць веданьня, робячы зло.

Экл 5

1 Ня будзь хуткі вуснамі тваімі, і сэрца тваё няхай не сьпяшаецца вымавіць слова перад
абліччам Божым, таму што Бог у небе, а ты — на зямлі. Дзеля гэтага няхай словы твае будуць
нешматлікімі.
2 Бо ад мноства заняткаў прыходзіць сон, і мноства словаў [мае] голас дурня.
3 Калі абяцаеш абяцаньне Богу, не марудзь выканаць яго, бо Ён ня мае ўпадабаньня да дурняў.
Калі што абяцаеш — споўні.

4 Шмат лепш не абяцаць, чым паабяцаць і ня споўніць.
5 Не дазваляй вуснам тваім уводзіць у грэх цела сваё і не кажы перад анёлам, што гэта
памылка; навошта [табе], каб Бог загневаўся на голас твой і зьнішчыў справы рук тваіх.
6 Бо ў мностве сноў і ў памнажэньні словаў — марнасьць, але ты бойся Бога!
7 Калі ты будзеш бачыць прыгнёт беднага і парушэньне суду і праведнасьці ў нейкай акрузе,
не зьдзіўляйся гэтым [рэчам], але мей суцяшэньне, бо высокага пільнуе вышэйшы, а над імі
— яшчэ вышэйшы.
8 І карысна для зямлі ў-ва ўсім, калі валадар абрабляе поле.
9 Хто любіць срэбра, той не насыціцца срэбрам, і хто любіць багацьце, той ня будзе мець
карысьці [з яго]; і гэта таксама марнасьць.
10 Памнажаюцца даброцьці, памнажаюцца і тыя, што іх зьядаюць; і што за карысьць уласьніку
з гэтага, хіба, гледзячы, глядзець вачыма сваімі?
11 Салодкі сон таго, хто працуе, ці мала, ці шмат ён пад'еў, але сытасьць багатага не дае яму
заснуць.
12 Ёсьць ліхая нядоля, якую я бачыў пад сонцам, — багацьце, якое захоўваецца на шкоду таму,
хто мае яго.
13 І загінула багацьце тое ў нешчасьлівым выпадку; і нарадзіў ён сына, і няма нічога ў руках
ягоных.
14 Бо як выйшаў ён з улоньня маці сваёй голы, так і вернецца назад, як прыйшоў, і нічога не
забярэ рукою сваёю з таго, што прыйшло праз цяжкую працу ягоную.
15 І гэта таксама ліхая нядоля: якім прыйшоў, такім і адыйдзе, і якая карысьць яму з таго, што
працаваў на вецер?
16 Таксама ўсе дні свае ён еў у цемры, у смутку вялікім, у немачы і прыкрасьці.
17 Вось што я ўбачыў: добра і прыгожа [чалавеку] есьці і піць, і бачыць добры [плод] кожнай
цяжкай працы сваёй, якой працаваў пад сонцам у палічаных днях жыцьця свайго, якое даў
яму Бог, бо гэта доля ягоная.
18 Таксама калі якому чалавеку Бог даў багацьце і маёмасьць, і даў уладу спажыць гэта, і браць
частку сваю, і радавацца з цяжкай працы сваёй, дык гэта дар Божы.
19 Бо ня будзе ён шмат памятаць пра дні жыцьця свайго, таму Бог дае радасьць у сэрца ягонае.

Экл 6

1 Ёсьць ліха, якое я бачыў пад сонцам, і цяжкае яно для чалавека:
2 Чалавек, якому Бог дае багацьце, і маёмасьць, і славу, і няма ніякай нястачы для душы ягонай
ні ў чым, чаго не пажадаў бы ён, і не дае яму Бог улады, каб спажыць гэта, але чужы чалавек
спажывае тое. Гэта марнасьць і ліхая немач.
3 Калі б нарадзіў чалавек сто [дзяцей], і пражыў шмат гадоў, і было б шмат дзён гадоў ягоных,
але душа ягоная не насыцілася дабром, і нават не было б магілы для яго, я скажу, што лепшая
[доля] спарона, чым таго [чалавека].
4 Бо ён прыйшоў як марнасьць, і ў цемру ідзе, і цемраю пакрыта імя ягонае,
5 нават ня ўбачыў ён сонца, і нічога не спазнаў, [але] мае большы спакой, чым [чалавек] той.
6 І хоць бы той [чалавек] жыў дзьве тысячы гадоў, і ня ўбачыў дабра, ці ж не ў адно месца ўсе
ідуць?
7 Уся цяжкая праца чалавека — дзеля вуснаў ягоных, але душа ягоная не насычаецца.
8 Бо чым лепшы мудры за дурня? Чым [лепшы] прыгнечаны, які ведае, як хадзіць перад
жывымі?
9 Лепш тое, што бачаць вочы, чым тое, куды імкнецца душа. Таксама гэта — марнасьць і пагоня
за ветрам.
10 Хто як названы, такое імя ягонае; і вядома, што ён — чалавек, і ня можа ён судзіцца з тым,
хто мацнейшы за яго.
11 Дзе шмат слоў, там памнажаецца марнасьць; і што мае з гэтага чалавек?
12 Бо хто ведае, што добра для чалавека ў жыцьці, у палічаных днях марнага жыцьця, якое
праходзіць, як цень? І хто распавядзе чалавеку, што будзе пасьля яго пад сонцам?

Экл 7

1 Лепш [добрае] імя, чым добры алей, і [лепш] дзень сьмерці, чым дзень нараджэньня.
2 Лепш ісьці ў дом жалобы, чым ісьці ў дом сьвяткаваньня, бо там — канец кожнага чалавека,
і [чалавек] жывы складае гэта ў сэрцы сваім.
3 Лепш смутак, чым сьмех, бо праз засмучанае аблічча будзе лепшым сэрца.
4 Сэрца мудрых — у доме жалобы, а сэрца дурняў — у доме радасьці.
5 Лепш чалавеку слухаць дакараньні мудрага, чым слухаць сьпеў дурняў.
6 Бо сьмех дурня — як трэскат трэсак пад гаршчком. І гэта таксама марнасьць.
7 Бо прыгнёт [іншых] мудрага робіць шалёным, і падарунак псуе сэрца.
8 Лепш канец справы, чым яе пачатак, лепш павольны [на гнеў], чым фанабэрысты.
9 Ня будзь хуткі да гневу ў духу тваім, бо гнеў жыве ў заўлоньні дурняў.
10 Не кажы: “Што гэта такое, што ранейшыя дні былі лепшыя, чым цяперашнія?”, бо ня з
мудрасьці ты пытаешся пра гэта.
11 Добрая мудрасьць разам са спадчынай, асабліва для таго, хто бачыць сонца.
12 Бо ў ценю мудрасьці як у ценю срэбра; і карысьць веданьня [ў тым, што] мудрасьць дае
жыцьцё таму, хто мае яе.
13 Паглядзі на справы Божыя, бо хто можа выпрастаць тое, што Ён скрывіў.
14 У дзень добры карыстайся з добрага, а ў дзень ліхі ўбач, што адно зрабіў Бог насупраць
другога, так што не знойдзе чалавек, што будзе пасля яго.
15 Усё гэта я бачыў у дні марнасьці маёй: вось, праведнік гіне ў праведнасьці сваёй, і вось
бязбожнік доўга жыве ў ліхоце сваёй.
16 Ня будзь залішне праведны, і ня будзь надта мудры! Навошта маеш нішчыць сам сябе?
17 Не асуджай залішне і ня будзь дурнем! Навошта табе паміраць ня ў свой час?
18 Добра, калі будзеш трымацца аднаго, і ад другога не прыбірай рукі тваёй, бо той, хто баіцца
Бога, пазьбегне ўсяго гэтага.
19 Мудрасьць робіць мудрага мацнейшым за дзесяць уладароў, якія ў горадзе.
20 Бо няма на зямлі чалавека праведнага, які робіць дабро і не грашыць.
21 Таксама кожнае слова, што гавораць, не ўкладай у сэрца тваё, і ня слухай, як слуга твой
праклінае цябе;
22 бо ведае сэрца тваё, што ты шмат разоў таксама праклінаў іншых.
23 Усё гэта я выпрабаваў мудрасьцю. Я сказаў: “Я буду мудрым”, але [мудрасьць] далёка ад
мяне.
24 Далёка тое, што ўжо было, і глыбокае, глыбокае. Хто знойдзе яго?
25 Зьвярнуў я сэрца маё, каб спазнаць і дасьледаваць, і шукаць мудрасьць і разуменьне, і каб
спазнаць, што бязбожнасьць — дурасьць, а глупота — шаленства.
26 І знайшоў я, што гарчэйшая за сьмерць жанчына, у якой сэрца як пастка і сіло, а рукі ейныя
— як путы. Хто добры перад абліччам Бога, той уратуецца ад яе; а грэшнік будзе злоўлены ёю.
27 Вось гэта я знайшоў, сказаў Эклезіяст, адно з другім [параўноўваючы], каб знайсьці
разуменьне.
28 Чаго яшчэ шукала душа мая і не знайшла? Чалавека аднаго з тысячы я знайшоў, а жанчыны
сярод усіх іх не знайшоў.
29 Вось толькі гэта я знайшоў, што Бог зрабіў чалавека правым, а яны шукаюць усялякія
прыдумкі.

Экл 8

1 Хто як мудрэц, і хто ведае значэньне рэчаў? Мудрасьць чалавека прасьвятляе аблічча ягонае,
і суровасьць аблічча ягонага зьмяняецца.
2 Я [раю]: [Словы] вуснаў валадара захоўвай дзеля словаў прысягі перад Богам.
3 Не сьпяшайся зыходзіць ад аблічча ягонага, не стой пры словах ліхіх, бо ўсё, што захоча, ён
зробіць.
4 Дзе слова валадара, там улада, і хто скажа яму: “Што ты робіш?”

5 Хто захоўвае прыказаньне, не дазнае ніякага ліха. А сэрца мудрага спазнае і час, і суд,
6 бо для кожнай рэчы ёсьць час і суд, а вялікае ліха чалавеку з-за таго,
7 што ня ведае ён, што будзе, і як гэта будзе, хто паведаміць яму?
8 Няма чалавека, які мае ўладу над ветрам, каб утрымаць вецер, і няма ўладара над днём сьмерці, і няма звальненьня ў гэтай вайне, і не ўратуе беззаконьне таго, хто мае яго.
9 Усё гэта я бачыў, і прыкладаў сэрца маё да ўсіх справаў, якія робяцца пад сонцам, [бачыў] час, калі чалавек мае ўладу над чалавекам на гора яму.
10 Таксама бачыў я злачынцаў пахаваных, і прыходзілі [да іх], і адыходзілі ад месца сьвятога, і забываліся ў горадзе, што яны так рабілі. І гэта таксама марнасьць.
11 Бо не адразу выносіцца прысуд супраць ліхіх учынкаў. Дзеля гэтага сэрца сыноў чалавечых напоўнена імі, каб чыніць зло.
12 Хоць грэшнік сто разоў чыніць зло, але доўга жыве. Але я ведаю таксама, што будзе добра тым, якія баяцца Бога, якія баяцца аблічча Ягонага.
13 І ня будзе добра бязбожніку, і не падоўжыць ён дзён сваіх, падобны да ценю той, хто ня мае страху перад абліччам Божым.
14 Ёсьць такая марнасьць, якая робіцца на зямлі, што ёсьць праведнікі, з якімі здараецца тое, на што заслугоўваюць учынкі бязбожнікаў, і ёсьць бязбожнікі, з якімі здараецца тое, на што заслугоўваюць учынкі праведнікаў. І я сказаў, што гэта таксама марнасьць.
15 І пахваліў я радасьць, бо няма нічога чалавеку лепшага пад сонцам, як есьці і піць, і весяліцца, і гэта няхай будзе з ім у цяжкай працы ягонай у дні жыцьця ягонага, якія даў яму Бог пад сонцам.
16 Калі прыклаў я сэрца маё, каб спазнаць мудрасьць і ўбачыць заняткі, якімі займаюцца на зямлі, бо дзень і ноч ня бачыць [чалавек] сну для вачэй сваіх,
17 тады ўбачыў я ўсе справы Божыя, што чалавек ня можа зразумець справы, якія робяцца пад сонцам; і колькі б чалавек ні намагаўся шукаць гэта, нічога ня знойдзе; і хаця б мудры сказаў, што ведае, ён ня можа знайсьці.

Экл 9

1 Да ўсяго гэтага я прыклаў сэрца сваё, каб спасьцігнуць усё гэта, што праведныя і мудрыя, і ўчынкі іхнія — у руцэ Божай, і таксама любоў і нянавісьць. І чалавек ня ведае ўсяго таго, што перад ім.
2 Усё для ўсіх адно: адна доля для праведніка і для бязбожніка, для добрага і чыстага і для нячыстага, для таго, хто ахвяроўвае, і для таго, хто не ахвяроўвае, як для добрага, так і для грэшнага; як для таго, які прысягае, так і для таго, які прысягаць баіцца.
3 І тое кепска ў-ва ўсім, што робіцца пад сонцам, што адна доля для ўсіх; і таксама сэрца сыноў чалавечых поўнае зла, і шаленства [маюць яны] ў сэрцы пад час жыцьця свайго, а потым [адыходзяць] да памёршых.
4 Бо той, хто знаходзіцца між усімі жывымі, мае надзею, бо лепш жывы сабака, чым здохлы леў.
5 Бо жывыя ведаюць, што памруць; а памёршыя нічога ня ведаюць, і ня маюць больш ніякай платы, бо забытая памяць пра іх.
6 Таксама любоў іхняя і нянавісьць іхняя, і зайздрасьць іхняя ўжо счэзьлі, і ня маюць яны ўжо часткі на вякі ў-ва ўсім, што робіцца пад сонцам.
7 Ідзі, еш з радасьцю хлеб твой і пі са спакойным сэрцам віно тваё, калі даспадобы Богу справы твае.
8 Увесь час няхай будзе белым адзеньне тваё, і алею на галаве тваёй няхай не бракуе.
9 Пражыві жыцьцё з жонкаю, якую кахаеш, у-ва ўсе дні марнага жыцьця твайго, якія дадзены табе пад сонцам на ўвесь час марнасьці тваёй, бо гэта частка твая ў жыцьці і ў-ва ўсёй цяжкай працы, якою працуеш пад сонцам.
10 Усё, што можа зрабіць рука твая, рабі паводле сілы тваёй, бо ў адхлані, у якую ты ідзеш, няма ані справаў, ані разуменьня, ані веданьня, ані мудрасьці.

11 І павярнуўся я, і ўбачыў пад сонцам, што ня шпаркім [даецца пасьпяховы] бег і не магутным
— [перамога ў] вайне, і ня мудрым — хлеб, і не разумным — багацьце, і ня знаўцам —
зычлівасьць, бо ад часу і выпадку залежыць усё гэта.
12 Бо таксама ня ведае чалавек часу свайго. Як рыбы трапляюць у згубную сетку, і як
птушкі заблытваюцца ў сіле, так сыны чалавечыя патрапляюць у ліхі час, які прыходзіць на
іх нечакана.
13 Таксама бачыў я такую мудрасьць пад сонцам, і вялікай яна [падалася] для мяне:
14 Горад малы, і людзей у ім няшмат, і прыйшоў да яго вялікі валадар, і атачыў яго, і насыпаў
супраць яго вялікія валы.
15 І знайшоўся ў ім чалавек бедны і мудры, і выратаваў горад той мудрасьцю сваёю; і ніводзін
чалавек не ўзгадаў гэтага беднага чалавека.
16 І я сказаў: “Мудрасьць лепшая за сілу, але мудрасьцю беднага пагарджаюць, і словаў ягоных
ня слухаюць”.
17 Спакойныя словы мудрых паслухаць [лепш], чым крык таго, хто пануе сярод дурняў.
18 Мудрасьць лепшая за зброю ваенную, а адзін грэшнік зьнішчыць шмат добрага.

Экл 10

1 Мёртвая муха робіць сьмярдзючым алей, і вылівае яго знаўца пахошчаў. Больш важыць
малое глупства, чым мудрасьць і слава.
2 Сэрца мудрага [зьвяртаецца] ў правы бок, а сэрца дурня — у левы.
3 Нават калі дурны ідзе дарогаю, яму не хапае розуму, і ён пакажа ўсім, што дурны.
4 Калі гнеў вялікага пана ўзьнімецца супраць цябе, заставайся на месцы сваім, бо цьвярозыя
паводзіны залагоджваюць вялікія правіны.
5 Ёсьць ліха, якое я бачыў пад сонцам, нібыта памылка, якая выходзіць ад аблічча ўладара:
6 дурань пастаўлены на высокасьці вялікай, а багатыя сядзяць нізка.
7 Бачыў я слугаў на конях, і князёў, якія як слугі, ідуць па зямлі.
8 Хто капае яму, той упадзе ў яе, а таго, хто ломіць агароджу, укусіць зьмяя.
9 Хто перасоўвае камяні, можа скалечыцца імі, і хто коле дровы, можа быць у небясьпецы ад
іх.
10 Калі ступіцца жалезная [сякера] і лязо яе не навострана, трэба больш прыкладаць сілы, але
больш карысьці будзе скарыстацца мудрасьцю.
11 Калі ўкусіць зьмяя незагавораная, няма ўжо карысьці ад таго, хто ўмее загаворваць.
12 Словы вуснаў мудрага — прыемнасьць, але вусны дурня губяць яго самога.
13 Пачатак словаў вуснаў ягоных — глупота, а канец [прамовы] вуснаў ягоных – ліхое
шаленства.
14 Бязглузды памнажае словы, хоць ня ведае чалавек, што будзе потым, і што пасьля яго
станецца, хто распавядзе яму?
15 Праца дурняў стамляе іх, бо ня ведае ён [нават], як дайсьці ў горад.
16 Гора табе, зямля, калі валадар твой — юнак, і калі твае князі ад раніцы ядуць.
17 Шчасьлівая зямля, калі валадар — сын шляхетных, калі князі ядуць у час [адпаведны] для
спасіленьня, а не каб нажэрціся.
18 Дзе лянота, там правісае столь, і дзе апушчаны рукі, там працякае дом.
19 Дзеля забавы ладзяць банкет, і віно разьвесяляе жыцьцё, а срэбра адказвае за ўсё.
20 Нават у думцы сваёй не кляні валадара, і ў спальні сваёй не кляні багатага, бо птушкі
нябесныя занясуць голас твой, і тыя, што маюць крылы, распавядуць слова.

Экл 11

1 Пускай хлеб свой па вадзе, таму што праз шмат дзён знойдзеш яго.
2 Давай частку сямі, і нават васьмі, бо ня ведаеш, якая бяда будзе на зямлі.
3 Калі хмары будуць напоўненыя дажджом, яны выльюць [яго] на зямлю, і калі дрэва ўпадзе
на поўдзень або на поўнач, на месцы, дзе ўпадзе, там і застанецца.
4 Хто назірае за ветрам, ня будзе сеяць, і хто глядзіць на хмары, ня будзе жаць.

5 Калі ты ня ведаеш, які шлях ветру і як [паўстаюць] косткі ва ўлоньні цяжарнай, падобна ня
ведаеш дзеяў Бога, Які робіць усё.
6 Раніцаю сей насеньне тваё, і ў вечары не спыняй рукі тваёй, бо ты ня ведаеш, з чаго будзе
больш карысьці, з аднаго ці з другога, ці з абодвух будзе аднолькава добра.
7 Салодкае сьвятло, і добра вачам бачыць сонца.
8 Бо калі шмат гадоў жыве чалавек, няхай радуецца з іх усіх, і няхай памятае пра дні цемры,
бо будзе іх шмат. Усё, што надыйдзе — марнасьць.
9 Радуйся, юнача, у маладосьці сваёй, і няхай сэрцу твайму будзе добра ў дні юнацтва твайго,
і хадзі шляхамі сэрца твайго і паводле таго, што бачаць вочы твае, і ведай, што за ўсё гэта Бог
прывядзе цябе на суд.
10 І прыбяры смутак з сэрца твайго, і аддалі ліхоцьце ад цела твайго, бо маладосьць і цёмнасьць
валасоў — марнасьць.

Экл 12

1 І памятай пра Творцу твайго ў дні юнацтва твайго, пакуль ня прыйдуць дні ліхія, і пакуль не
сустрэнуць цябе гады, пра якія скажаш: “Не падабаюцца мне яны”,
2 пакуль не зацемрыцца сонца, і сьвятло, і месяц, і зоркі, пакуль ня вернуцца пасьля дажджу
хмары,
3 у дні, калі будуць дрыжэць вартаўнікі дому і хістацца мужы моцныя, і кінуць малоць
млынары, бо іх будзе мала, і пацямнеюць тыя, што глядзяць праз вокны,
4 і будуць замкнутыя дзьверы на вуліцу, і сціхне голас жорнаў, і будуць ускокваць на голас
птушкі, і змоўкнуць усе дочкі сьпеваў,
5 і будуць баяцца вышыняў, і жахацца на дарозе; і заквітнее дрэва мігдалёвае, і пацяжэ
саранча, і асыпецца капэрс, бо пойдзе чалавек у дом вечнасьці сваёй, і будуць хадзіць вакол
яго па вуліцы плачкі,
6 пакуль не парвецца срэбны ланцужок, і не раструшчыцца залатая чаша, і не паб’ецца збан
пры крыніцы, і ня зломіцца калаўрот над студняю,
7 і вернецца парахно ў зямлю, чым яно і было, а дух вернецца да Бога, Які даў яго.
8 Марнасьць марнасьцяў, сказаў Эклезіяст, усё — марнасьць.
9 Акрамя таго, што Эклезіяст быў мудры, ён вучыў таксама людзей ведам, і прыслухоўваўся, і
дасьледаваў, і склаў шмат прыповесьцяў.
10 Імкнуўся Эклезіяст знайсьці прыгожыя словы, і запісаць шчыра словы праўды.
11 Словы мудрых — як джалы, і як цьвікі моцна ўбітыя — тыя, што сабралі іх; яны дадзены
адзіным Пастырам.
12 А што звыш гэтага, сыне мой, таго сьцеражыся: складаньню шматлікіх кнігаў няма канца, і
доўгае вучэньне — стома для цела.
13 Сутнасьць усяго слова, што было пачута: бойся Бога і захоўвай прыказаньні Ягоныя, бо ў
гэтым — усё для чалавека!
14 Бо ўсе ўчынкі Бог прывядзе на суд, і ўсё схаванае, і добрае, і ліхое.

ПЕСЬНЯ ПЕСЬНЯЎ САЛЯМОНА

1 Песьня песьняў Салямона.
2 «Няхай ён цалуе мяне пацалункамі вуснаў сваіх!» «Бо пяшчоты твае лепшыя за віно.
3 Пах алейкаў тваіх салодкі. Алей разьліты — імя тваё. Дзеля гэтага дзяўчыны кахаюць цябе».
4 «Цягні мяне за сабой! Пабяжым! Увядзі мяне, валадару, у пакоі свае». «Будзем радавацца і весяліцца з табою, будзем узгадваць пра пяшчоты твае [больш], чым пра віно; заслужана кахаюць цябе!»
5 «Чарнявая я, і зграбная, дочкі Ерусалімскія, як намёты Кедара, як палатніны Салямона.
6 Не глядзіце на мяне, што я смуглявая, бо сонца апаліла мяне. Сыны маці маёй разгневаліся на мяне, паставілі мяне пільнаваць вінаграднікі, а я не ўпільнавала вінаграднік мой.
7 Распавядзі мне, каханьне душы маёй, дзе ты пасьвіш, дзе адпачываеш апоўдні, каб не блукаць мне між чародаў таварышаў тваіх».
8 «Калі ня ведаеш гэтага, найпрыгажэйшая між жанчынаў, дык ідзі па сьлядах авечак, і пасьві казьлянятаў тваіх каля буданоў пастушыных.
9 Да жаробкі ў калясніцы фараона я ўпадобніў цябе, сяброўка мая.
10 Прыгожыя шчочкі твае пад кляйнотамі, шыя твая — у каралях.
11 Мы зробім табе кляйноты залатыя з блішчыкамі срэбнымі».
12 «Пакуль валадар быў за сталом сваім, нард мой разьліваў водар свой.
13 Любы мой для мяне — як мяшэчак з мірам, які начуе на грудзях маіх.
14 Любы мой для мяне — як гронка кіпровая ў вінаграднікі Эн-Геды».
15 «Якая прыгожая ты, сяброўка мая, якая прыгожая! Вочы твае — як галубкі».
16 «Які прыгожы ты, любы мой, які цудоўны! Ложак наш — зеляніна,
17 страха дому нашага — кедры, столь нашая — кіпарысы».

Псн 2

1 «Я — нарцыс Сарону, лілея даліны!»
2 «Як лілея сярод церняў, так сяброўка мая сярод дзяўчатаў».
3 «Як яблына сярод дрэваў лясных, так любы мой сярод хлопцаў. У ценю ягоным прывабным я села, і плод ягоны салодкі для паднябеньня майго.
4 У дом банкетаваньня ён увёў мяне, і сьцяг ягоны нада мною — каханьне.
5 Падмацуйце мяне пірагамі з разынкамі, асьвяжыце мяне яблыкамі, бо я млею ад каханьня.
6 Левая рука ягоная пад галавою маёй, а правіцай сваёй ён абдымае мяне».
7 «Заклінаю вас, дочкі Ерусалімскія, сарнамі і ланямі палявымі, не будзіце і не падымайце каханую, аж пакуль сама не захоча».
8 «Голас любага майго! Вось, ён ідзе, узыходзіць на горы, пераскоквае ўзгоркі.
9 Любы мой падобны да сарны, да маладога аленя. Вось, ён стаіць за сьцяною нашаю, заглядае праз вакно, зазірае праз краты.
10 Адказаў любы мой і сказаў да мяне: “Уставай, сяброўка мая, прыгажуня мая, і прыходзь.
11 Бо вось, зіма прайшла, дождж спыніўся і перастаў.
12 Пралескі відаць на зямлі, час сьпяваньня настаў, і голас туркаўкі чуваць у зямлі нашай.
13 Дрэва фігавае выдала пупышкі [свае], вінаград квітнее і разьлівае водар. Устань, прыходзь, сяброўка мая; прыгажуня мая, прыходзь!
14 Галубка мая, [што жывеш] у расколінах скалы, у схове пад стромаю, пакажы мне выгляд твой, дай мне пачуць голас твой, бо голас твой салодкі, і выгляд твой прывабны”».
15 «Лавіце нам лісаў, малых лісянятаў, якія нішчаць вінаграднікі, бо вінаграднікі нашыя квітнеюць».
16 «Любы мой [належыць] мне, а я — яму, ён пасьвіць сярод лілеяў.

17 Пакуль дзень дыхае [ветрам] і зьнікаюць цені, вярніся! Будзь падобны, любы мой, да сарны,
да маладога аленя на гарах Бэтэр».

Псн 3

1 «На ложку маім уначы я шукала таго, якога кахае душа мая; шукала яго і не знайшла.
2 “Устану і буду кружляць па горадзе, па вуліцах і па плошчах. Буду шукаць таго, якога кахае
душа мая”. Шукала яго і не знайшла.
3 Спаткалі мяне вартаўнікі, якія абыходзяць горад. “Ці ня бачылі вы таго, якога кахае душа
мая?”
4 Ледзь мінула іх, спаткала таго, якога кахае душа мая, схапіла яго і не пушчу, аж пакуль не
завяду яго ў дом маці маёй, у пакой той, якая нарадзіла мяне».
5 «Заклінаю вас, дочкі Ерусалімскія, сарнамі і ланямі палявымі, не будзіце, не падымайце
каханую, пакуль сама не захоча».
6 «Хто яна, якая выходзіць з пустыні як слупы дыму, духмяная мірам і кадзілам, і ўсякімі
водарамі, [што прывозяць] гандляры.
7 Вось ложак Салямона. Шэсьцьдзясят волатаў вакол яго, з волатаў Ізраіля.
8 Усе яны трымаюць мячы, спраўныя ў вайне, кожны мае меч пры боку сваім супраць страхаў
начных.
9 Драгі зрабіў для сябе валадар Салямон з дрэва Лібанскага;
10 слупкі іхнія зрабіў са срэбра, прыслон — з золата, сядзеньне ягонае — з пурпуру. Сярэдзіна
іхняя выслана каханьнем дачок Ерусалімскіх».
11 «Выйдзіце і паглядзіце, дочкі Сыёну, на валадара Салямона ў кароне, якой укаранавала яго
маці ягоная ў дзень заручынаў ягоных, у дзень радасьці сэрца ягонага».

Псн 4

1 «Якая прыгожая ты, сяброўка мая, якая ты прыгожая! Вочы твае — як галубкі пад кудзеркамі
тваімі. Валасы твае — як чарада козаў, якія зыходзяць з гары Гілеад.
2 Зубы твае — як чарада стрыжаных авечак, якія выходзяць з купаньня; у кожнай пара ягнятак,
і няплоднай няма сярод іх.
3 Быццам стужка кармазыновая — губы твае, і вусны твае салодкія. Як паловы яблыка
гранатовага шчочкі твае пад кудзеркамі тваімі.
4 Як вежа Давідава шыя твая, збудаваная для абароны, тысяча шчытоў завешана на ёй, усё —
зброя волатаў.
5 Грудзі твае — як двое казьлянятаў, блізьнятаў сарны, якія пасьвяцца сярод лілеяў.
6 Пакуль дзень дыхае [ветрам] і зьнікаюць цені, пайду на гару міры і на ўзгорак кадзіла.
7 Уся ты прыгожая, сяброўка мая, і заганы няма ў табе.
8 Са мною з Лібану, нявеста мая, са мною з Лібану ідзі; паглядзі з вяршыні Аману, з вяршыні
Сэніру і Гермону, з лежышчаў львоў, з гор леапардаў.
9 Паланіла ты сэрца маё, сястра мая нявеста, паланіла ты сэрца маё адным [позіркам] вачэй
тваіх, і аднымі пацеркамі на шыі тваёй.
10 Якое цудоўнае каханьне тваё, сястра мая нявеста, лепшае каханьне тваё, чым віно. А пах
алейкаў тваіх [лепшы] за ўсе пахошчы.
11 Мёд сотавы сьцякае з вуснаў тваіх, нявеста, мёд і малако пад языком тваім, а водар шатаў
тваіх — як водар Лібану.
12 Замкнёны сад — сястра мая, нявеста, замкнёны сад, крыніца запячатаная.
13 Улоньне тваё — сад яблык гранатовых з адборнымі пладамі, кіпэр і нард.
14 Нард і шафран, [пахкі] трысьнёг і цынамон з усімі дрэвамі ладану, міра і альвасу і з усімі
найлепшымі пахошчамі.
15 Ты — крыніца ў садзе, студня вады жывой, якая сьцякае з Лібану.
16 Абудзіся, вецер з поўначы! Прыйдзі, вецер з поўдня; дзьмі на сад мой, і няхай пацякуць
пахошчы ягоныя». «Няхай прыйдзе любы мой у сад свой, і няхай есьць найлепшыя плады
ягоныя».

Псн 5

1 «Я ўвайшоў у сад мой, сястра мая, нявеста; зьбіраю міру маю з пахошчамі маімі, ем соты мае
з мёдам маім, п'ю віно маё з малаком маім. Ешце, сябры, і піце, і насычайцеся каханьнем!»
2 «Я сплю, а сэрца маё чувае. [Вось,] голас любага майго, які стукае! "Адчыні мне, сястра мая,
сяброўка мая, галубка мая, беззаганная мая, бо галава мая ўся ў расе, кучары мае — у кроплях
начных!"
3 Адзеньне маё я скінула з сябе, ці [зноў] мне апранаць яго? Памыла ногі свае, ці зноў маю
брудзіць іх?
4 Любы мой працягнуў руку сваю праз адтуліну і задрыжэла ў-ва мне нутро маё.
5 Я ўстала, каб адчыніць любаму майму; і з рук маіх сьцякала міра, і з пальцаў маіх міра
каштоўнае [капала] на клямку засаўкі.
6 Я адчыніла любаму майму; але любы мой пайшоў, аддаліўся. Душа мая млела, калі ён
прамаўляў. Шукала яго і не знайшла яго, гукала яго і ён не азваўся мне.
7 Спаткалі мяне вартаўнікі, якія абыходзяць горад; зьбілі мяне і паранілі мяне, забралі
покрыва маё ў мяне вартаўнікі муроў.
8 Заклінаю вас, дочкі Ерусалімскія, калі спаткаеце любага майго, што вы скажаце яму?
[Скажыце,] што я зьнемаглася ад каханьня».
9 «Чым любы твой мілейшы ад другіх, найпрыгажэйшая з жанчынаў? Чым любы твой
мілейшы ад другіх, што ты так заклінаеш нас?»
10 «Любы мой белы і румяны, найлепшы сярод дзясяткаў тысячаў.
11 Галава ягоная — шчырае золата, золата найчысьцейшае, кучары ягоныя — як гронкі фінікаў,
чорныя як крумкачы.
12 Вочы ягоныя — як галубы над водамі бруістымі, купаюцца ў малацэ, сядзяць над струмянём
паўнаводным.
13 Шчокі ягоныя — як кветнік пахошчаў, на якіх растуць зёлкі духмяныя; вусны ягоныя — лілеі,
з іх цячэ міра найлепшае.
14 Рукі ягоныя — вальцы залатыя, напоўненыя тапазамі; жывот ягоны — выраб з косьці
слановай, выкладзены шафірамі.
15 Ногі ягоныя — слупы з мармуру, пастаўленыя на апоры залатыя; выгляд ягоны — як Лібан,
велічны, нібы кедры.
16 Вусны ягоныя — слодыч, і ўвесь ён прывабны. Вось такі любы мой, і вось такі сябар мой,
дочкі Ерусалімскія».

Псн 6

1 «Куды пайшоў любы твой, найпрыгажэйшая з жанчынаў? Куды дзеўся любы твой? Мы
будзем шукаць яго з табою».
2 «Любы мой пайшоў у сад свой, у кветнік пахошчаў, каб пасьвіць у садах і каб зьбіраць лілеі.
3 Я [належу] любаму майму, а любы мой — мне, ён пасьвіць сярод лілеяў».
4 «Прыгожая ты, сяброўка мая, як Тырца, прывабная як Ерусалім, грозная як полк са сьцягамі.
5 Адвярні вочы твае ад мяне, бо яны хвалююць мяне. Валасы твае — як чарада козаў, якія
зыходзяць з Гілеаду.
6 Зубы твае — як чарада стрыжаных авечак, якія выходзяць з купаньня; у кожнай пара ягнятаў,
і няплоднай няма сярод іх.
7 Як палова яблыка гранатовага шчочкі твае пад кудзеркамі тваімі.
8 Ёсьць шэсьцьдзясят валадарак, і восемдзясят наложніц, і дзяўчат бяз ліку,
9 але адзіная ты, галубка мая, дасканалая мая, адзіная ў маці сваёй, чыстая ў той, якая
нарадзіла цябе. Убачылі яе дзяўчаты, і назвалі шчасьлівай, [убачылі] валадаркі і наложніцы, і
хвалілі яе:
10 "Хто ж гэта, якая выходзіць як заранка, прыгожая як месяц, ясная як сонца, грозная як полк
са сьцягамі?"»
11 «Я зыйшла ў сад арэхавы, каб паглядзець на зеляніну пры ручаі, каб паглядзець, ці квітнее
вінаград, ці ў квецені дрэвы гранатовыя.

12 Не заўважыла душа мая, як пасадзілі мяне ў калясніцу магната народу майго».

Псн 7

1 «Агляніся, агляніся, Шуламянка, агляніся, агляніся, і мы паглядзім на цябе». «Што вы
глядзіце на Шуламянку, нібы на танец двух карагодаў?»
2 «Якія прыгожыя ногі твае ў сандалах, дачка шляхетная! Выгін клубоў тваіх як аздобны абруч,
які зроблены рукою майстра.
3 Улоньне тваё — як чаша круглая, ніколі не забракне ў ёй віна мяшанага; жывот твой — як
сноп пшаніцы, абстаўлены лілеямі.
4 Двое грудзей тваіх — як двое казьлянятаў, блізьнятаў сарны.
5 Шыя твая — як вежа з косьці слановае. Вочы твае — як сажалкі ў Хешбоне, каля брамы Бат-
Раббім. Нос твой — як вежа Лібану, што глядзіць у бок Дамаску.
6 Галава твая над табою — як Кармэль, а валасы на галаве тваёй — як пурпур. Валадар зьвязаны
косамі [тваімі].
7 Якая ты прыгожая і якая прыемная, каханая, у асалодзе [тваёй]!
8 Стан твой [гонкі], як пальма, а грудзі — як гронкі [вінаградныя].
9 Я сказаў: "Узьлезу я на пальму і схаплю гронкі яе", і будуць грудзі твае як гронкі вінаградныя,
і пах подыху твайго — як [пах] яблыкаў.
10 Вусны твае — як віно найлепшае, якое ліецца да любага, асалоджваючы вусны стомленыя».
11 «Я [належу] любаму майму, і да мяне памкненьне ягонае.
12 Прыйдзі, любы мой, пойдзем у поле, пераначуем за горадам.
13 Устанем раніцай, наведаем вінаграднікі, паглядзім, ці заквітнеў вінаград, ці распусьціліся
кветкі ці цьвітуць дрэвы гранатовыя, там я дам табе каханьне маё.
14 Мандрагоры разьліваюць водар, у дзьвярах нашых усякія плады адборныя, новыя і старыя,
якія я, любы мой, захавала для цябе».

Псн 8

1 «Калі б ты быў братам маім, які смактаў грудзі маці маёй, калі б сустрэла цябе на вуліцы, я
б пацалавала цябе, і ніхто не дакараў бы мяне.
2 Я схапіла б цябе і павяла б у дом маці маёй; і ты вучыў бы мяне, а я напаіла б цябе пахкім
віном і сокам яблыкаў гранатовых маіх.
3 Левая рука ягоная пад галавой маёй, а правіцай сваёй ён абдымае мяне».
4 «Заклінаю вас, дочкі Ерусалімскія, не будзіце і не падымайце каханую, аж пакуль сама не
захоча».
5 «Хто гэта, якая выходзіць з пустыні, абапіраючыся на любага свайго?» «Пад яблынай я
пабудзіў цябе; там зачала цябе маці твая, там зачала цябе тая, што нарадзіла цябе.
6 Палажы мяне як пячатку на сэрца тваё, як пячатку на плячо тваё, бо магутнае як сьмерць
каханьне, і няўмольная як пекла рэўнасьць, жар яе — як жар агню, як полымя ГОСПАДА.
7 Вялікія воды ня змогуць патушыць каханьне, і рэкі не затопяць яго. Калі б чалавек хацеў
аддаць усю маёмасьць дому свайго за каханьне, ён быў бы адрынуты з пагардай».
8 «Сястра нашая малая, і грудзей няма ў яе. Што мы зробім для сястры нашай у дзень, калі
будуць гаварыць пра яе?
9 Калі яна — мур, мы пабудуем на ім палац са срэбра, калі яна — брама, мы ашалюем яе
дошкамі кедровымі».
10 «Я — мур, і грудзі мае — як вежы, таму я буду ў вачах ягоных як тая, што знайшла супакой.
11 Вінаграднік быў у Салямона ў Баал-Гамоне; ён аддаў вінаграднік тым, што пільнуюць яго;
за плады ягоныя кожны прыносіў тысячу [сыкляў] срэбра.
12 Вінаграднік мой, які маю, перада мною; тысячу [сыкляў] табе, Салямоне, а дзьвесьце — тым,
якія пільнуюць плады ягоныя».
13 «О ты, якая жывеш у садах, таварышы твае слухаюць голас [твой], дай і мне пачуць яго».
14 «Уцякай, любы мой, будзь падобны да сарны, да маладога аленя на гарах пахкіх дрэваў!»

КНІГА ПРАРОКА ІСАІ

1 Відзеж Ісаі, сына Амоса, які ён бачыў адносна Юды і Ерусаліму ў дні Узіі, Ётама, Ахаза і Эзэкіі,
валадароў Юды.
2 Слухайце, нябёсы, і ты, зямля, прыхілі вушы, бо ГОСПАД прамаўляе: «Я выкарміў сыноў і
ўзгадаваў іх, а яны пайшлі супраць Мяне.
3 Вол ведае гаспадара свайго, і асёл — жолаб уласьніка свайго, а Ізраіль ня ведае [Мяне], народ
Мой не разумее».
4 Гора табе, народ грэшны, народ, абцяжараны беззаконьнем, насеньне ліхадзейскае, сыны
сапсутасьці! Вы пакінулі ГОСПАДА, пагардзілі Сьвятым Ізраіля, павярнуліся сьпінай [да Яго].
5 Дзе вас яшчэ ўдарыць, калі вы множыце злачынствы? Уся галава хворая, і ўсё сэрца млоснае;
6 ад стапы нагі аж да чубу галавы няма на ім месца здаровага, раны і сінякі, і апухлыя шнары,
не агледжаныя, не перавязаныя, і алеем не злагоджаныя.
7 Зямля вашая спустошана, гарады вашыя агнём папалены; чужынцы топчуць палеткі вашыя
на вачах вашых; спусташэньне як пасьля зьнішчэньня Садому.
8 Дачка Сыёну пакінута як намёт у вінаградніку, як будан у агародзе, як горад у аблозе.
9 Калі б ГОСПАД Магуцьцяў не пакінуў нам рэшты, сталіся б мы як Садом, былі б падобныя да
Гаморы.
10 Слухайце слова ГОСПАДА, князі Садомскія, пачуйце закон Бога нашага, народ Гаморы!
11 «Навошта Мне мноства ахвяраў вашых? — кажа ГОСПАД. — Я насычаны цэласпаленьнямі
казлоў і тлустасьцю кормных цялятаў; кроў валоў, бараноў і казлоў Мне абрыдла.
12 Калі вы прыходзіце перад аблічча Маё, хто жадае, каб вы тапталі панадворак Мой?
13 Не складайце больш ахвяраў пустых! Каджэньне абрыдла Мне. Сьвятаў маладзіка, суботаў
і голасу сходаў не магу вытрываць, бо нягодныя ўрачыстасьці [вашыя].
14 Брыдзіцца душа Мая сьвятамі маладзіка і ўрачыстасьцямі вашымі. Яны сталіся Мне
цяжарам, Я мучуся, іх пераносячы!
15 Калі вы выцягваеце рукі, Я адварочваю вочы Мае ад вас, і нават калі павялічыце малітвы
вашыя, ня выслухаю, бо рукі вашыя ў крыві.
16 Абмыйцеся, будзьце чыстымі! Прыбярыце ліхоту ўчынкаў вашых з вачэй Маіх! Спыніцеся
чыніць зло!
17 Навучыцеся рабіць дабро, рупцеся пра суд, дапамагайце пакрыўджанаму, абараняйце
сіротаў, заступайцеся за ўдоваў!
18 Тады прыходзьце і спрачайцеся са Мною, — кажа ГОСПАД. Хоць бы грахі вашыя былі, як
пурпур, як сьнег стануцца белымі; хоць бы былі чырвоныя, як кармазын, стануцца як воўна.
19 Калі вы скарыцеся і будзеце слухаць Мяне, будзеце спажываць даброцьці зямлі.
20 А калі адмовіцеся і ня будзеце слухаць, вынішчыць вас меч, бо гэта сказалі вусны ГОСПАДА!»
21 Як стаўся распусьніцай горад верны, поўны суду? Праведнасьць жыла ў ім, а цяпер —
забойцы.
22 Срэбра тваё сталася жужалем, віно зьмяшалася з вадою.
23 Князі твае — бунтаўнікі і супольнікі злодзеяў; яны ўсе любяць падарункі і гоняцца за
хабарамі, а не спагадаюць сіраце, і справа ўдоваў іх не цікавіць.
24 Дзеля гэтага так кажа Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, Моцны Ізраіля: «Я буду цешыцца з
супраціўнікаў Маіх, і адпомшчу ворагам Маім.
25 І павярну руку Маю на цябе, і лугам ачышчу руду тваю, і прыбяру ўсё волава тваё.
26 І ўзнаўлю судзьдзяў тваіх, як былі раней, і раднікаў тваіх — як было на пачатку. Тады
назавуць цябе Горадам Праведнасьці, Цьвярдыняй вернай».
27 Сыён будзе выбаўлены праз правасудзьдзе, а тыя, што навернуцца ў ім — праз праведнасьць.
28 І [будзе] загуба для адступнікаў і грэшнікаў, і тыя, што пакідаюць ГОСПАДА, загінуць.

29 Бо сорамна будзе вам дзеля дуброваў, якія вам падабаюцца, у ганьбе будзеце дзеля садоў,
якія вы сабе выбралі.
30 Бо вы станецеся як той дуб, лісьце якога ссохла, і як сад, у якім няма вады.
31 І станецца дужы як зрэб'е, а праца ягоная — як зьнічка, і згараць яны разам, і ня будзе каму
тушыць.

Іс 2

1 Слова, якое бачыў Ісая, сын Амоса, пра Юду і Ерусалім.
2 І станецца ў апошнія дні, што гара Дому ГОСПАДА ўзвысіцца па-над усе горы і ўздымецца над
узгоркамі, і пасьпяшаюцца да яе ўсе народы.
3 І пойдуць народы шматлікія, і скажуць: «Хадземце, узыйдзем на гару ГОСПАДА і ў Дом Бога
Якубавага, і няхай Ён навучыць нас шляхам Сваім, і будзем хадзіць па сьцежках Ягоных, бо з
Сыёну выйдзе Закон, і слова ГОСПАДА — з Ерусаліму».
4 І Ён будзе судзіць народы і вінаваціць многіх людзей. І перакуюць яны мячы свае на плугі, а
дзіды — на сярпы. Не падыме народ на народ меч, і ня будуць больш вучыцца ваяваць.
5 Доме Якуба! Хадземце і будзем хадзіць у сьвятле ГОСПАДА.
6 Ты адкінуў народ Твой, дом Якуба, бо яны напоўнены [тым, што прынялі] з усходу, і
варажбітамі, як Філістынцы; і з сынамі чужынцаў яны ў згодзе.
7 І напоўнілася зямля ягоная срэбрам і золатам, і няма канца скарбам ягоным, і напоўнілася
зямля ягоная коньмі, і няма канца калясьніцам ягоным.
8 І напоўнілася зямля ягоная ідаламі, і ён пакланяецца творам рук сваіх, таму, што зрабілі
пальцы ягоныя.
9 І пахіліўся чалавек, і прынізіўся кожны, і Ты не даруй ім.
10 Увайдзі ў скалу, схавайся ў парахне ад страху перад ГОСПАДАМ, перад бляскам велічы
Ягонай.
11 Пыхлівыя вочы чалавека спакорацца, і ўзьвялічваньне чалавека будзе паніжана. Толькі
ГОСПАД будзе ўзвышаны ў той дзень.
12 Бо дзень ГОСПАДА Магуцьцяў [прыйдзе] на ўсё ганарыстае і пыхлівае, і на ўсіх пыхліўцаў,
каб упакорыліся,
13 і на ўсе кедры Лібану, гонкія і ўзьнёслыя, і на ўсе дубы Башану,
14 і на ўсе горы высокія, і на ўсе ўзгоркі ўзьнесеныя,
15 і на ўсе вежы высачэзныя, і на ўсе муры ўмацаваныя,
16 і на ўсе караблі Таршышу, і на ўсе ўпрыгожваньні пажаданыя.
17 І будзе паніжана пыхлівасьць чалавека, і будзе спакорана ўзьвялічваньне людзей. Толькі
ГОСПАД будзе ўзвышаны ў той дзень,
18 і ідалы цалкам зьнікнуць.
19 І ўвойдуць у пячоры ў скале і ў ямы ў парахне ад страху перад ГОСПАДАМ і перад бляскам
велічы Ягонай, калі Ён паўстане, каб напоўніць страхам зямлю.
20 У той дзень выкіне чалавек кратам і кажанам ідалаў сваіх срэбных і ідалаў сваіх залатых,
якія зрабіў сабе, каб пакланяцца ім,
21 і ўвойдзе ў пячоры і шчыліны скалаў ад страху перад ГОСПАДАМ і перад бляскам велічы
Ягонай, калі Ён паўстане, каб напоўніць страхам зямлю.
22 Пакіньце [спадзявацца] на чалавека, у якога дыханьне ў ноздрах ягоных, бо што ён варты?

Іс 3

1 Вось Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, забярэ ў Ерусаліма і ў Юды моц і падпору, усю падпору хлеба
і ўсю падпору вады,
2 волата і ваяра, судзьдзю і прарока, прадказальніка і старосту,
3 пяцідзясятніка і магната, радніка і мудрага ў мастацтве, і здольнага ў загаворваньні.
4 І дам ім за князёў юнакоў, і хлапчукі будуць панаваць над імі.

5 І ў народзе адзін будзе ўціскаць другога, і кожны — бліжняга свайго; юнак будзе зьневажаць
старога, і нікчэмны — паважанага.
6 Тады схопіць чалавек брата свайго ў доме бацькі свайго [і скажа:] «Ты маеш адзеньне, дык
будзь кіраўніком нашым, і няхай будуць руіны гэтыя пад рукой тваёй».
7 [А той] падымецца ў дзень той, кажучы: «Не магу перавязаць раны, і ў доме маім няма ані
хлеба, ані адзеньня. Ня стаўце мяне кіраўніком народу».
8 Бо спатыкаецца Ерусалім, і Юда падае, бо язык іхні і ўчынкі іхнія — супраць ГОСПАДА, яны
бунтуюцца ў вачах славы Ягонай.
9 Выраз аблічча іхняга сьведчыць супраць іх, як Садом выяўляюць яны грэх свой і не хаваюць
[яго]. Гора душы іхняй, бо яны самі сабе рыхтуюць зло.
10 Скажыце праведніку, што будзе добра яму, бо ён будзе спажываць плод учынкаў сваіх.
11 А ліхотніку — гора, бо ён [атрымае] ліха, бо адплата яму будзе паводле [ўчынкаў] рук
ягоных.
12 Народзе Мой, немаўля цябе крыўдзіць, а жанчыны над табой пануюць. Народзе Мой,
правадыры твае ашукваюць цябе і шлях сьцежкі тваёй блытаюць.
13 Падняўся ГОСПАД, каб праводзіць суд, і стаіць, каб судзіць народы.
14 ГОСПАД ідзе на суд старшыняў народу Свайго і князёў ягоных: «Гэта вы спустошылі
вінаграднікі, і зрабаванае ў беднага — у дамах вашых.
15 Якім правам вы ўціскаеце народ Мой і засмучаеце абліччы ўбогіх? — кажа Госпад, ГОСПАД
Магуцьцяў».
16 І сказаў ГОСПАД: «За тое, што дочкі Сыёну заганарыліся і, выцягваючы, выцягваюць шыю, і
міргаюць вачыма, крочаць дробнымі крокамі і зьвіняць бранзалетамі на нагах сваіх,
17 Госпад зробіць, што лысымі стануць галовы дачок Сыёну, і ГОСПАД аголіць сорам іхні.
18 У той дзень паскідае Госпад аздобу бранзалетаў, і зорачкі, і паўмесяцы,
19 кольцы, нараменьнікі і вэлюмы,
20 дыядэмы і ланцужкі на нагах, і стужкі, і бутэлечкі з пахошчамі, і амулеты,
21 пярсьцёнкі і колцы для носу,
22 выкшталцоныя сукенкі і накідкі, шалі і торбачкі,
23 і люстэркі, і ценькую бялізну, абвіцьці і лёгкія сукенкі.
24 І станецца замест прыемных пахаў — смурод, замест поясу — вяроўка, замест учасаных
валасоў — лысіна, замест багатай вопраткі — цесны мяшок, замест красы — ганьба.
25 Мужчыны твае пагінуць ад мяча, і рыцары твае — на вайне.
26 І загалосяць, і жалобай апрануцца брамы ейныя, і будзе яна спустошаная, і сядзе на зямлі.

Іс 4

1 І схопяць сем жанчынаў аднаго мужчыну ў той дзень, кажучы: «Хлеб свой будзем есьці і
адзеньне сваё будзем апранаць. Дазволь толькі насіць нам імя тваё, здымі ганьбу нашую».
2 У той дзень Парастак ГОСПАДА будзе красою і славаю, а плод зямлі — гонарам і ўслаўленьнем
для тых, якія застануцца ў Ізраілі.
3 І станецца, што той, хто застаўся на Сыёне і хто пакінуты ў Ерусаліме, будзе названы сьвятым,
кожны, хто запісаны, каб жыць у Ерусаліме,
4 калі Госпад абмые бруд дочак Сыёну і ачысьціць Ерусалім ад крыві з сярэдзіны ягонай
подыхам суду і подыхам ачышчэньня.
5 І створыць ГОСПАД на ўсім абшары гары Сыён і на месцы сходу воблака ўдзень, а дым і бляск
полымя агню — уначы, бо над усім будзе слава [Госпада] як заслона,
6 і як намёт, каб даць цень ад сьпёкі ўдзень і прыбежышча і сховішча ад навальніцы і дажджу.

Іс 5

1 І буду я сьпяваць Любаму майму сьпеў пра вінаграднік Ягоны. Любы мой меў вінаграднік на
ўзгорку ўрадлівым.

2 Ён абкапаў яго і ачысьціў яго ад камянёў, і пасадзіў у ім найлепшую лазу вінаградную, і
пабудаваў вежу на сярэдзіне яго, і паставіў у ім тоўчню, і спадзяваўся, што вырасьце вінаград,
але вырасьлі дзікія ягады.
3 І цяпер, жыхары Ерусаліму і мужы Юды, рассудзіце паміж Мною і вінаграднікам Маім.
4 Што мусіў Я яшчэ зрабіць для вінаградніку Майго, а не зрабіў? Чаму, калі чакаў, што ўродзіць
вінаград, ён урадзіў дзікія ягады?
5 І цяпер Я паведамлю вам, што Я зраблю з вінаграднікам Маім: прыбяру жываплот ягоны, і
ён будзе на зьнішчэньне, развалю агароджу ягоную, і будзе ён на патаптаньне,
6 і аддам яго на спусташэньне; ня будзе ён абцінаны і абкопваны, і зарасьце цернем і асотам, і
хмарам Я забараню даваць дождж яму.
7 Бо вінаграднік ГОСПАДА Магуцьцяў — гэта дом Ізраіля, а мужы Юды — парастак выбраны
Яго. І Я спадзяваўся, [што будзе] суд, а вось, праліцьцё крыві, [чакаў] праведнасьці, а вось
крыкі [пагрозаў].
8 Гора тым, якія далучаюць дом да дому, а поле дадаюць да поля, ажно [іншым] не застаецца
месца, быццам вы адны толькі жывіцё на зямлі.
9 У вушы мае [сказаў] ГОСПАД Магуцьцяў: «Сапраўды, шмат дамоў будзе зруйнавана, вялікіх
і прыгожых, і будуць яны без жыхароў.
10 Бо дзесяць моргаў вінаградніку дадуць адзін бат, а насеньне з гомару дасьць эфу.
11 Гора тым, якія, устаўшы рана, шукаюць сікеру, якія п'юць аж да вечара, каб віно разагравала
іх.
12 Гусьлі і ліры, бубны і жалейкі, і віно на баляваньнях іхніх, а пра справы ГОСПАДА яны ня
дбаюць, і твораў рук Ягоных ня бачаць.
13 Дзеля таго пойдзе ў няволю народ Мой, бо ён ня мае разуменьня, і магнаты ягоныя будуць
галадаваць, а мноства ягонае пасохне ад смагі.
14 Таму адхлань пашырыла горла сваё і разьзявіла бяз меры пашчу сваю, і зыйдзе туды
велічнасьць яго, і мноства яго, і гоман яго, і тыя, што весяляцца ў ім.
15 І будзе паніжаны чалавек, і будзе ўпакораны муж, і вочы фанабэрыстых будуць скораныя.
16 І ўзвысіцца ГОСПАД Магуцьцяў у судзе, і Бог Сьвяты выявіць сьвятасьць Сваю ў праведнасьці.
17 І будуць пасьвіцца авечкі як на пашы сваёй, і казьляняты будуць есьці траву сярод руінаў.
18 Гора тым, якія на пастронках марнасьці валакуць беззаконьне, і грахі — на вяроўках возу,
19 і кажуць: "Няхай Ён пасьпяшаецца і паскорыць дзеяньні Свае, каб мы ўбачылі, і няхай
зьдзейсьніцца намер Сьвятога Ізраіля, каб мы даведаліся!"
20 Гора тым, якія зло называюць дабром, а дабро — злом, якія лічаць цемру сьвятлом, а сьвятло
— цемраю, горкае лічаць салодкім, а салодкае — горкім.
21 Гора тым, якія мудрыя ў вачах сваіх і якія разумныя перад самімі сабою.
22 Гора тым, якія адважныя, каб піць віно і мужныя, каб мяшаць сікеру,
23 якія за хабар апраўдваюць вінаватага, а праведнасць праведніка адсоўваюць ад яго.
24 Таму як салому зьядае язык вогненны, а сена зьнікае ў полымі, так корань іхні станецца
гнільлём, і краса іхняя разьляціцца, як пыл, бо яны адкінулі Закон ГОСПАДА Магуцьцяў, і
словамі Сьвятога Ізраіля пагардзілі.
25 Таму ўзгарэўся гнеў ГОСПАДА на народ Ягоны, і Ён выцягнуў руку Сваю супраць яго, каб
пакараць яго, і задрыжэлі горы, і трупы іхнія [сталіся] як сьмецьце сярод вуліцы. Але на гэтым
усім не спыніўся гнеў Ягоны, і рука Ягоная яшчэ выцягнута.
26 І Ён падыме сьцяг да народу далёкага, і засьвішча яму з канца зямлі, і ён прыйдзе хутка і
лёгка;
27 ня будзе стомленых у ім і ніхто не спатыкнецца, ніводзін не задрэмле і не засьне, і ня будзе
зьняты пояс з паясьніцы ягонай, і ня лопне рамень сандалаў ягоных.
28 Стрэлы ягоныя вострыя і ўсе лукі ягоныя напятыя; капыты коней ягоных — як крэмень,
колы [калясьніцаў] ягоных — як віхор.
29 Рык ягоны — як рык ільвіцы; і рыкаючы, рыкае ён як львяняты, і раве, і хапае здабычу, і нясе,
і ніхто ня выратуе.

30 І ён зараве над [здабычай] у той дзень як раве мора; і ён гляне на зямлю, і вось, цемра і
прыгнёт, і сьвятло схавалася ў хмарах».

Іс 6

1 У год сьмерці валадара Узіі бачыў я Госпада, Які сядзеў на пасадзе высокім і ўзьнесеным, а
прыполы [шатаў] Ягоных напаўнялі сьвятыню.
2 Сэрафімы стаялі вакол Яго; і кожны меў па шэсьць крылаў, і кожны двума закрываў аблічча
сваё, і двума закрываў ногі свае, а двума лётаў.
3 І ўсклікалі яны адзін да аднаго, і казалі: «Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты ГОСПАД Магуцьцяў, уся
зямля поўная славы Ягонай!»
4 І захісталіся бэлькі дзьвярэй ад голасу тых, якія клікалі, і Дом напоўніўся дымам.
5 І я сказаў: «Гора мне! Бо я загублены! Бо я — чалавек з нячыстымі вуснамі, і я жыву сярод
людзей з нячыстымі вуснамі, і Валадара, ГОСПАДА Магуцьцяў убачылі вочы мае!»
6 І падляцеў да мяне адзін з сэрафімаў, а ў руцэ ягонай — вугаль распалены, які ён шчыпцамі
ўзяў з ахвярніка.
7 І ён дакрануўся ім да вуснаў маіх, і сказаў: «Вось, ён дакрануўся да вуснаў тваіх, і прыбрана
беззаконьне тваё, і адкуплены грэх твой».
8 І пачуў я голас Госпада, кажучы: «Каго Мне паслаць? Хто пойдзе дзеля Нас?» І я сказаў:
«Вось я, пашлі мяне».
9 І Ён сказаў: «Ідзі і кажы народу гэтаму: “Слыхам слухаць будзеце, і не зразумееце, поглядам
глядзець будзеце, і не даведаецеся”.
10 Зрабі цьвёрдым сэрца народу гэтага, зрабі цяжкімі вушы ягоныя і засьляпі вочы ягоныя,
каб вачыма сваімі ня бачыў, і вушамі сваімі ня чуў, і каб сэрца ягонае не зразумела, каб ён не
навярнуўся, і ня быў аздароўлены».
11 І я спытаў: «Як доўга, Госпадзе?» І Ён сказаў: «Пакуль ня будуць спустошаны гарады без
жыхароў і дамы без людзей, і зямля будзе спустошана як пустка».
12 І выкіне ГОСПАД людзей, і будзе вялікая пустэча пасярод зямлі.
13 І калі яшчэ застанецца на ёй дзясятая частка [людзей], і яна вернецца, і будзе зьнішчана.
Але як тэрэбінт і як дуб, ад якога [застаецца] пень пасьля таго, як ён сьсечаны, так насеньне
сьвятое — гэта пень іхні.

Іс 7

1 І сталася ў дні Ахаза, сына Ётама, сына Узіі, валадара Юды, пайшоў Рэцын, валадар Сірыі, і
Пэках, сын Рэмаліі, валадар Ізраілю, ваяваць супраць Ерусаліму, але не маглі здабыць яго.
2 І паведамілі дому Давіда, кажучы: «Сірыя стала [табарам] у Эфраіме!» І задрыжэла сэрца
[валадара] і сэрца народу ягонага, як хістаюцца дрэвы ў лесе ад ветру.
3 І сказаў ГОСПАД Ісаі: «Выйдзі насустрач Ахазу, ты і Шэар-Яшуб, сын твой, на канец каналу
верхняй сажалкі, на дарогу Поля Валюшніка,
4 і скажаш яму: “Сьцеражыся і будзь у супакоі, ня бойся, і няхай сэрца тваё ня слабне з
прычыны гэтых двух рэштак галавешак, якія дымяць, перад полымем гневу Рэцына, і Сірыі, і
сына Рэмаліі,
5 бо вырашылі [ўчыніць] супраць цябе ліха Сірыя, Эфраім і сын Рэмаліі, кажучы:
6 “Пойдзем на Юду, напалохаем яго, і здабудзем яго для сябе, і паставім над ім валадаром сына
Табээля!”
7 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: Ня станецца [гэтага], і нічога ня будзе!
8 Бо галава Сірыі — Дамаск, а галава Дамаску — Рэцын. Яшчэ шэсьцьдзясят пяць гадоў, і будзе
Эфраім зламаны, і ня [будзе] народам.
9 А галава Эфраіма — Самарыя, і галава Самарыі — сын Рэмаліі. Калі не паверыце, не
ўтрымаецеся”».
10 І зноў прамовіў ГОСПАД да Ахаза, кажучы:
11 «Прасі сабе знак у ГОСПАДА, Бога твайго, ці ў глыбіні адхлані, ці высока ўгары».
12 І сказаў Ахаз: «Ня буду прасіць і ня буду спакушаць ГОСПАДА».

13 І сказаў [Ісая]: «Слухайце, дом Давіда! Ці ж мала вам быць цяжарам для людзей, што вы
таксама абцяжарваеце Бога майго?
14 Дзеля гэтага Госпад Сам дасьць вам знак. Вось, Дзева зачне і народзіць Сына, і назаве імя
Ягонае Імануэль.
15 Масла і мёд Ён будзе есьці, пакуль не навучыцца адкідаць зло і выбіраць дабро.
16 Бо перш, чым хлопец навучыцца адкідаць зло і выбіраць дабро, будзе пакінутая зямля, якая
перад абліччам двух валадароў, якіх ты баішся.
17 Прывядзе ГОСПАД на цябе, і на народ твой, і на дом бацькі твайго дні, якіх не было ад дзён,
калі адлучыўся Эфраім ад Юды, [прывядзе] валадара Асірыйскага.
18 І станецца ў той дзень, засьвішча ГОСПАД да мухі, якая на канцы рэкаў Эгіпту, і да пчалы ў
зямлі Асірыі.
19 І яны прыляцяць, і абсядуць усе ўзбоччы яроў і шчыліны скалаў, усе цярніны і ўсе хмызьнякі.
20 У той дзень абголіць Госпад лязом, нанятым за ракою, валадаром Асірыйскім, галаву і
валасы на нагах, і таксама бараду абрэжа.
21 І станецца ў той дзень, што кожны будзе гадаваць карову і дзьве авечкі,
22 і станецца дзеля вялікага ўдою малака будзе есьці масла, бо масла і мёд будзе есьці кожны,
хто застанецца ў зямлі гэтай.
23 І станецца ў той дзень, што ўсякае месца, дзе была тысяча вінаградных лозаў, вартых тысячы
[сыкляў] срэбра, стане цернем і асотам.
24 Са стрэламі і лукамі будуць хадзіць там, бо ўся зямля стане цернем і асотам.
25 А на ўсе горы, якія абраблялісяматыкаю, ніхто ня пойдзе туды, баючыся церняў і асоту; і
стануцца яны выганам для валоў і на таптаньне для ягнятаў».

Іс 8

1 І сказаў ГОСПАД да мяне: «Вазьмі сабе табліцу вялікую і напішы на ёй літарамі чалавечымі:
“Магер-Шалал-Хаш-Баз”».
2 І ўзяў я для сябе сьведкаў верных — Урыю сьвятара і Захарыю, сына Евэрэхіі.
3 І я наблізіўся да прарочыцы, і яна зачала, і нарадзіла сына. І сказаў ГОСПАД мне: «Назаві імя
ягонае Магер-Шалал-Хаш-Баз,
4 бо перш, чым хлопец навучыцца клікаць “тата мой” і “мама мая”, занясуць багацьці Дамаску
і здабычу Самарыі перад аблічча валадара Асірыйскага».
5 І працягнуў ГОСПАД прамаўляць да мяне яшчэ, кажучы:
6 «За тое, што народ гэты адкідае воды Шыляаху, якія цякуць паволі, а захапляецца Рэцынам і
сынам Рэмаліі,
7 таму вось, Госпад узьніме на іх воды ракі, магутныя і шматлікія — валадара Асірыйскага і ўсю
славу ягоную, і ўзьнімецца [рака] па-над усе рэчышчы свае, і выльецца з усіх берагоў сваіх;
8 і разальецца ў Юдзе, і затопіць [яго], і падымецца высока аж да шыі, і крылы ейныя будуць
раскінутыя на ўсю шырыню зямлі тваёй, Імануэль!»
9 «Рабіце ліхоту, народы, і будзеце напалоханыя, і прыхіліце вуха, усе землі далёкія!
Падперажыцеся, і будзеце напалоханыя. Падперажыцеся, і будзеце напалоханыя!
10 Радзьце раду, [што рабіць], і яна ня зьдзейсьніцца. Прамаўляйце слова, і ня станецца
[паводле яго], бо з намі Бог».
11 Бо гэта сказаў мне ГОСПАД, калі схапіў [мяне] рукою і перасьцярог мяне, каб я не хадзіў
шляхам народу гэтага, кажучы:
12 «Не называйце змовай тое, што народ гэты заве змовай, і таго, чаго ён баіцца, ня бойцеся і
не палохайцеся.
13 ГОСПАДА Магуцьцяў, Яго сьвяціце, Ён — страх ваш, і Ён [няхай] палохае вас.
14 І Ён будзе сьвятыняй, камянём спатыкненьня і скалой спакусы для абодвух дамоў Ізраіля,
пасткай і сілом для жыхароў Ерусаліму.
15 І спатыкнуцца аб іх шматлікія, і ўпадуць, і разаб’юцца, патрапяць у сіло і будуць злоўленыя».
16 Завяжы сьведчаньне, запячатай Закон [унутры] вучняў Маіх.

17 І я буду чакаць ГОСПАДА, Які хавае аблічча Сваё ад дому Якуба, і буду спадзявацца на Яго.
18 Вось я і дзеці, якіх даў мне ГОСПАД. Мы — на знак і на перасьцярогу ў Ізраілі ад ГОСПАДА
Магуцьцяў, Які жыве на гары Сыён.
19 І калі скажуць вам: «Спытайцеся ў тых, якія выклікаюць духаў памерлых і ў варажбітоў, якія
цьвіркочуць і мармычуць», [адкажыце]: «Ці ж народ ня мусіць зьвяртацца да Бога свайго? Ці
ж у памёршых [пытацца] пра жывых?»
20 [Зьвяртайцеся] да Закону і да сьведчаньня! Калі яны ня будуць казаць паводле слова гэтага,
няма для іх [сьвятла] зараніцы.
21 І будзе ён бадзяцца па [зямлі] ўцісканы і галодны. І станецца, калі ён згаладнее, будзе
гневацца і будзе праклінаць валадара свайго і Бога свайго, і гляне ўгару,
22 і паглядзіць на зямлю, і вось, гора і цемра, і цемрадзь уціску, і змрок непраглядны. Але ня
будзе цемрадзь [назаўсёды] для таго, хто ўцісканы.

Іс 9

1 У часы мінулыя Ён адкінуў зямлю Завулёна і зямлю Нэфталі; але ў будучыні праславіць шлях
да мора, другі бок Ярдану, Галілею паганскую.
2 Народ, які ходзіць у цемры, убачыў сьвятло вялікае, над жыхарамі зямлі ценю сьмерці
сьвятло зазьзяла.
3 Ты памножыў народ і павялічыў радасьць. Яны будуць радавацца перад абліччам Тваім, як
радуюцца ў [час] жніва, як цешацца, дзелячы здабычу.
4 Бо ярмо цяжару ягонага, кій, [які на] плячах ягоных, дубец крыўдзіцеля ягонага Ты зламаў
як у дзень Мадыяну.
5 Бо кожны бот вайсковы, які шоргае гучна, і кожны плашч, заліты крывёю, будзе на спаленьне,
на спажыву агню.
6 Бо Дзіця нарадзілася нам, Сын дадзены нам, улада на плячах Ягоных, і назавуць імя Ягонае:
Цудоўны Дарадца, Бог Магутны, Бацька Вечнасьці, Князь Супакою.
7 Вялікая будзе ўлада Ягоная, і супакою ня будзе канца на пасадзе Давіда і ў валадарстве
Ягоным, якое Ён паставіць моцна і ўмацуе судом і праведнасьцю ад цяпер і на вякі. Рэўнасьць
ГОСПАДА Магуцьцяў зробіць гэта.
8 Слова паслаў Госпад на Якуба, і ўпала яно на Ізраіля,
9 і даведаецца яго ўвесь народ; Эфраім і жыхары Самарыі, якія з пыхаю і ганарлівасьцю сэрца
кажуць:
10 «Цэглы пападалі, а мы пабудуем з камянёў; сьсеклі сікаморы, мы заменім [іх] кедрамі!»
11 І ГОСПАД падняў прыгнятальніка Рэцына на яго і ворагаў ягоных павярнуў [на яго],
12 Сірыю — з усходу, а Філістынцаў — з захаду, і яны жэрлі Ізраіля поўнай пашчай. Пры ўсім
гэтым не адвярнуўся [ад іх] гнеў Ягоны, і яшчэ выцягнутая рука Ягоная.
13 Але народ не павярнуўся да Таго, Хто пабіў яго, і ГОСПАДА Магуцьцяў яны не шукалі.
14 І адрэзаў ГОСПАД у Ізраіля галаву і хвост, пальму і чарот у адзін дзень.
15 Стары і паважаны — гэта галава, а прарок, які вучыць хлусьні — гэта хвост.
16 І сталася, што тыя, якія вядуць народ гэты, зводзяць яго, і тыя, якіх яны вядуць, гінуць.
17 Дзеля гэтага Госпад ня будзе радавацца дзеля юнакоў ягоных, і над сіротамі ягонымі
і ўдовамі ягонымі ня зьлітуецца, бо ўсе — крывадушнікі і ліхотнікі, і ўсе вусны гавораць
глупства. Пры ўсім гэтым не адвярнуўся [ад іх] гнеў Ягоны, і яшчэ выцягнутая рука Ягоная.
18 Бо разгарэлася бязбожнасьць, як агонь, зьядае церні і асот, і палае ў гушчары лесу, і
ўзнімаюцца слупы дыму.
19 Ад гневу ГОСПАДА Магуцьцяў загарыцца зямля, і народ станецца спажывай агню, і не
пашкадуе чалавек брата свайго.
20 І будзе рэзаць з правага боку, і будзе галодны; і будзе есьці з левага боку, і не насыціцца;
кожны будзе есьці цела рамяна свайго;
21 Манаса — Эфраіма, а Эфраім — Манасу, і абодва разам — Юду. Пры ўсім гэтым не адвярнуўся
[ад іх] гнеў Ягоны, і яшчэ выцягнутая рука Ягоная.

Іс 10

1 Гора заканадаўцам, [якія ўстанаўляюць] законы беззаконныя і пішуць пастановы жорсткія,
2 каб адмовіць у правасудзьдзі ўбогім, каб пазбавіць суду прыгнечаных народу Майго, каб
удовы сталіся здабычай іхняй, і сіротаў абрабаваць.
3 А што вы будзеце рабіць у дзень наведваньня, калі загуба прыйдзе здалёк? Да каго пабяжыцё
за дапамогай і дзе пакінеце славу вашую?
4 Нічога [ня зробіце], мусіце схіліцца сярод палонных, і ўпасьці сярод забітых. Пры ўсім гэтым
не адвярнуўся [ад іх] гнеў Ягоны, і яшчэ выцягнутая рука Ягоная.
5 Гора Асірыі, яна — дубец гневу Майго, і кій ярасьці Маёй у руцэ іхняй.
6 Супраць народу крывадушнага Я пасылаю яго, і пра народ гневу Майго Я загадваю, каб
здабыць здабычу [ў ім] і зрабаваць рабаваньнем, таптаць яго таптаньнем, як балота на вуліцы.
7 Але ён ня так будзе думаць, і сэрца ягонае ня так будзе лічыць, бо ў сэрцы ягоным — [намер]
нішчыць і загубіць нямала народаў.
8 Бо ён кажа: «Ці ж князі мае ўсе разам не валадары?
9 Ці ж Кально не такі, як Кархэміш? Ці ж Хамат не такі, як Арпад? Ці ж Самарыя не такая, як
Дамаск?
10 Бо рука мая ўзяла валадарствы ідалаў, а ў іх балванаў [больш], чым у Ерусаліме і ў Самарыі.
11 Як я зрабіў з Самарыяй і ідаламі ейнымі, ці ж не зраблю гэтак сама з Ерусалімам і ідаламі
ягонымі?»
12 І станецца, калі Госпад скончыць усе справы Свае на гары Сыён і ў Ерусаліме, [Ён скажа]: «Я
наведаю плод пыхлівага сэрца валадара Асірыі і фанабэрыю ганарыстых вачэй ягоных».
13 Бо ён сказаў: «Сілай рукі маёй я зрабіў гэта і мудрасьцю маёй, бо — разумны. Я зьмяніў
межы народаў і зрабаваў скарбы іхнія, і як дужы я скідваю жыхароў [іхніх].
14 І як тое гняздо знайшла рука мая багацьце народаў, і як зьбіраюць пакінутыя яйкі, так я
забраў усю зямлю; і не было нікога, хто б трапянуў крылом, і ніхто не адчыніў дзюбы, і ня
цьвіркнуў».
15 Ці ж ганарыцца сякера перад тым, хто сячэ ёю? Ці ж вывышаецца піла па-над тым, хто пілуе
ёю? Нібыта дубец будзе рухаць тым, хто падымае яго; нібыта кій падымае таго, хто ня [ёсьць]
дрэвам.
16 Дзеля гэтага Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў спашле хударлявасьць на тлустых ягоных; і сярод
слаўных ягоных распаліць полымя, як полымя агню.
17 І станецца Сьвятло Ізраіля агнём, а Сьвяты ягоны — полымем; Ён будзе палаць і паесьць
церні ягоныя і асот ягоны ў адзін дзень.
18 І славу лесу ягонага і саду ягонага, ад душы аж да цела, Ён вынішчыць. І станецца, што
змарнее ён, як той хворы.
19 І рэшта дрэваў у лесе ягоным будзе такой малой, што хлопчык іх палічыць.
20 І станецца ў той дзень, што рэшта Ізраіля і ўратаваныя з дому Якуба ня будуць больш
абапірацца на таго, хто б'е іх, але будуць абапірацца ў праўдзе на ГОСПАДА, Сьвятога Ізраіля.
21 Рэшта навернецца, рэшта Якуба [навернецца] да Бога Магутнага.
22 Бо хоць бы народ твой, Ізраіль, быў як пясок марскі, толькі рэшта навернецца. Загуба
прызначана, каб зьдзейсьнілася праведнасьць.
23 Бо загубу прызначаную зьдзейсьніць Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, сярод усёй зямлі.
24 Дзеля гэтага так кажа Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў: «Народ Мой, які жыве на Сыёне, ня бойся
Асірыі, якая дубцом б'е цябе і кій свой падымае, як на шляху Эгіпецкім.
25 Бо яшчэ крыху, яшчэ хвіліну, і спыніцца ярасьць, і гнеў Мой павернецца на загубу іхнюю».
26 І ўзбудзіць ГОСПАД Магуцьцяў біч на яго, як тады, калі пабіў Мадыян каля скалы Арэў, і калі
[падняў] кій Свой над морам, і ўзьняў яго на шлях Эгіпецкі.
27 І станецца ў той дзень, што зваліцца цяжар ягоны з плячэй тваіх, і ярмо ягонае з шыі тваёй;
і распадзецца ярмо ад [тлустасьці] алею.
28 Ён прыходзіць ад Аят, праходзіць праз Мігрон, у Міхмашу ставіць рэчы свае.
29 Пераходзяць яны вандол, у Геве начуюць. Дрыжыць Рама, Гіва Саўлава ўцякае.

30 Крычы голасам тваім, дачка Галіму! Прыхілі вуха, Ляіша! Адкажы ёй, Анатот!
31 Мадмена ўцякае, жыхары Гевіму хаваюцца.
32 Яшчэ дзень ён будзе стаяць у Нове; пагражаць рукою сваёй гары дачкі Сыёну, узгорку Ерусалімскаму.
33 Вось Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў абсякае галіны сярод страху [вялікага]; і ўзьнесеныя вышынёй [сваёй] будуць пасьцінаныя, і ўзвышаныя будуць паніжаныя.
34 І Ён пасячэ жалезам гушчары лясныя, і Лібан упадзе ад Магутнага.

Іс 11

1 І выйдзе Парасьць з пня Есэя, і Парастак вырасьце з кораня ягонага,
2 І супачыне на Ім Дух ГОСПАДА, дух мудрасьці і розуму, дух рады і магутнасьці, дух веданьня і страху перад ГОСПАДАМ.
3 І ўпадабаньне Ягонае — у страху перад ГОСПАДАМ, і Ён будзе судзіць не паводле погляду вачэй Сваіх, і не паводле слыху вушэй Сваіх будзе даваць прысуд,
4 але Ён будзе судзіць бедных паводле праведнасьці і пакорным зямлі будзе даваць суд паводле справядлівасьці. І Ён ударыць зямлю кіем вуснаў Сваіх, і подыхам вуснаў Сваіх заб'е бязбожніка.
5 І станецца праведнасьць поясам на сьцёгнах Ягоных, а вернасьць — поясам на паясьніцы Ягонай.
6 І будзе жыць воўк з ягнём, а леапард з казьлянём будуць ляжаць, цяля і леў, і кормнае цяля [будуць] разам, і малы хлопчык паганяць іх будзе.
7 Карова і мядзьведзіца будуць пасьвіцца разам, а іх дзіцяняты будуць ляжаць [побач], і леў будзе есьці салому, як вол.
8 І немаўля будзе гуляць каля нары гадзюкі, і дзіцятка выцягне руку сваю да гнязда зьмяі.
9 Ня будуць рабіць зла і ня будзе зьнішчэньня на ўсёй гары Маёй сьвятой, бо зямля будзе напоўнена веданьнем ГОСПАДА, як воды напаўняюць мора.
10 І станецца ў той дзень, што корань Есэя будзе стаяць як знак для народаў. Яго будуць шукаць народы, і будзе слаўным месца супачынку Ягонага.
11 І станецца ў той дзень, што ГОСПАД зноў другі раз [выцягне] руку сваю, каб выкупіць рэшту народу Свайго, якая застанецца ў Асірыі і Эгіпце, у Патросе і Кушы, у Эляме і Шынэары, у Хамаце і на астравах марскіх.
12 І Ён падыме знак для народаў, і зьбярэ выгнанцаў Ізраіля, і пазьбірае расьцярушаньне Юды з чатырох канцоў зямлі.
13 І спыніцца зайздрасьць Эфраіма, і будуць выгубленыя ненавісьнікі Юды. Эфраім ня будзе зайздросьціць Юдзе, а Юда ня будзе ваяваць супраць Эфраіма.
14 І яны паляцяць на плечы Філістынцаў да мора, і разам абрабуюць сыноў Усходу; на Эдом і на Мааў накладуць рукі свае, і сыны Амона будуць ім падуладнымі.
15 І ГОСПАД паложыць закляцьце на затоку мора Эгіпецкага, і патрасе рукою Сваёй над ракою ў моцы ветру Свайго, і разьдзеліць яе на сем ручаінаў, і можна будзе перайсьці яе ў сандалах.
16 І будзе шырокая дарога для рэшты народу Ягонага, якія застануцца з [выгнаньня] ў Асірыю, як гэта было ў той дзень для Ізраіля, калі ён выходзіў з зямлі Эгіпецкай.

Іс 12

1 І ты скажаш у той дзень: «Слаўлю Цябе, ГОСПАДЗЕ, бо Ты гневаўся на мяне, але гнеў Твой адвярнуўся [ад мяне], і Ты пацешыў мяне.
2 Вось Бог — збаўленьне маё! Спадзяюся на Яго і ня буду баяцца, бо ГОСПАД, ГОСПАД — моц мая і песьня мая, Ён стаўся збаўленьнем маім».
3 І вы з радасьцю будзеце чэрпаць ваду з крыніцаў збаўленьня.
4 І скажаце ў дзень гэты: «Слаўце ГОСПАДА! Клічце імя Ягонае! Абвяшчайце сярод народаў дзеяньні Ягоныя! Узгадвайце, якое ўзьвялічанае імя Ягонае!
5 Выслаўляйце ГОСПАДА, бо Ён зрабіў велічнае! Няхай гэта будзе вядома па ўсёй зямлі.
6 Гамані і крычы з радасьці, жыхарка Сыёну, бо вялікі пасярод цябе Сьвяты Ізраіля!»

Іс 13

1 Цяжар адносна Бабілону, які бачыў Ісая, сын Амоса.
2 На лысай гары пастаўце знак, узьніміце крык супраць іх. Махайце рукою, каб увайшлі ў
брамы магнатаў.
3 Я загадаў пасьвячоным Маім, у гневе Маім паклікаў волатаў Маіх, якія цешацца велічнасьцю
Маёй.
4 Голас мноства ў гарах, быццам народу шматлікага, голас гоману валадарстваў, народаў, якія
сабраліся [разам]. ГОСПАД Магуцьцяў аглядае войскі для вайны.
5 Прыходзяць з зямлі далёкай, з канцоў неба ГОСПАД і прылады гневу Ягонага, каб спустошыць
усю зямлю.
6 Галасіце, бо блізкі дзень ГОСПАДА, ён прыходзіць як спусташэньне ад Усемагутнага.
7 Дзеля гэтага ўсе рукі слабеюць і ўсе сэрцы людзей млеюць.
8 І яны трымцяць. Боль і мучэньні ахапілі іх, яны качаюцца [ад болю], як тая, што нараджае, і
адзін на другога глядзяць аслупянела, палымнеюць абліччы іхнія.
9 Вось, дзень ГОСПАДА надыходзіць, бязьлітасны, [поўны] абурэньня і полымя гневу, каб
зямлю зрабіць пустэчаю і грэшнікаў ейных выгубіць з яе.
10 Бо зоркі нябесныя і сузор'і іхнія ня будуць сьвяціць сьвятлом сваім, сонца зацемрыцца пры
ўзыходзе сваім і месяц ня будзе зьзяць сьвятлом сваім.
11 І Я пакараю ў сусьвеце зло, і бязбожнікаў — за беззаконьне іхняе, і спыню пыху ганарлівых,
і прыніжу фанабэрыю крыўдзіцеляў.
12 І Я зраблю мужа каштоўнейшым, чым золата найчысьцейшае, і чалавека —
[каштоўнейшым,] чым золата з Афіру.
13 Дзеля гэтага Я ўзварухну неба, і зямля захістаецца на месцы сваім ад абурэньня ГОСПАДА
Магуцьцяў, у дзень, калі запалае гнеў Ягоны.
14 І станецца, што кожны як сарна, якая ўцякае, і як авечка, якой няма каму пасьвіць, вернецца
да народу свайго і кожны ўцячэ ў зямлю сваю.
15 Кожны, хто будзе знойдзены, будзе прабіты [дзідай], і кожны, хто будзе схоплены, упадзе
ад мяча.
16 І дзеці іхнія будуць пасечаныя на вачах іхніх, дамы іхнія будуць абрабаваныя, а жонкі іхнія
— зьняслаўленыя.
17 Вось, Я ўзьніму супраць іх Мідзянаў, якія ня думаюць пра срэбра і ня маюць упадабаньня ў
золаце.
18 І будуць забіваць юнакоў лукі [іхнія], і яны ня будуць мець літасьці да плоду ўлоньня і ня
будзе шкадаваць сыноў вока іхняе.
19 І станецца, што Бабілон, краса валадарстваў, аздоба гонару Халдэйцаў, будзе зруйнаваны
Богам як Садом і Гамора.
20 Ня будзе ён абжыты на вякі, і ня будзе заселены з пакаленьня ў пакаленьне, і не паставіць
там Араб намёт, пастухі ня будуць адпачываць там.
21 І будуць там вылежвацца зьвяры пустыні, і совы напоўняць дамы іхнія, і будуць жыць там
страусы, і казлы будуць скакаць там.
22 І будуць скавытаць шакалы ў хорамах іхніх, і цмокі — у палацах раскошных.

Іс 14

1 І блізкі ўжо час ягоны, і дні ягоныя ня будуць цягнуцца. Бо зьлітуецца ГОСПАД над Якубам,
і зноў выбярэ Сабе Ізраіля, і зьмесьціць іх у зямлі іхнія; і далучыцца да іх прыхадзень, і будзе
належаць да дому Якуба.
2 І возьмуць іх народы, і завядуць іх да месца іхняга, і атрымае іх дом Ізраіля ў зямлі ГОСПАДА
як слугаў і служак. І яны палоняць тых, якія іх паланілі, і будуць мець уладу над крыўдзіцелямі
сваімі.
3 І станецца ў дзень, калі ГОСПАД дасьць табе супачынак ад пакутаў тваіх, ад гароты тваёй і ад
працы цяжкай, якую ты мусіў рабіць,

4 што ўзьнясеш ты гэтую прыповесьць пра валадара Бабілонскага, і скажаш: «Як надыйшоў
канец крыўдзіцелю, спыніліся зьдзекі ягоныя!
5 Паламаў ГОСПАД кій бязбожнікаў, дубец тых, што пануюць,
6 які біў народы ў лютасьці, б'ючы няспынна, які ў гневе меў уладу над народамі,
перасьледуючы іх без шкадаваньня.
7 Супачыла, супакоілася ўся зямля, сьпявае радасна.
8 Нават кіпарысы і кедры лібанскія радуюцца дзеля цябе, [кажучы]: "Калі ты зьлёг, ніхто не
прыходзіць сьсякаць нас".
9 Апраметная, што ўнізе, затрэслася дзеля цябе, каб [выйсьці] насустрач прыходу твайму,
абудзіць дзеля цябе памёршых, усіх правадыроў зямлі, і падняць з пасадаў іхніх усіх валадароў
народаў.
10 Усе яны адкажуць і скажуць табе: "Таксама ты саслабеў, як і мы, стаўся падобным да нас".
11 Укінута ў апраметную пыха твая і гукі гусьляў тваіх. Паслана пад табою чарвямі, і чарвяк —
накрыцьцё тваё.
12 Як ты зваліўся з неба, дзяньніца, сын зараніцы? Разьбіўся аб зямлю той, які перамагаў
народы.
13 Ты казаў у сэрцы тваім: "Узыйду на неба і вышэй зорак Божых пастаўлю пасад мой, і сяду
на гары зграмаджэньня, на скраю поўначы,
14 падымуся па-над вяршыні аблокаў, буду падобны да Найвышэйшага".
15 Але ты скінуты ў пекла, на самае дно!
16 Тыя, што ўбачаць цябе, будуць прыглядацца да цябе і разважаць: "Ці ж гэта ня той муж, які
ўстрасаў зямлю, хістаў валадарствы,
17 які ўвесь сусьвет зрабіў пустыняю, а гарады ягоныя руйнаваў, які палонных сваіх не
адпускаў дадому?"
18 Усе валадары народаў, усе яны ляжаць у славе, кожны ў доме сваім,
19 а ты выкінуты з магілы тваёй як парасьць абрыдлая, ты аточаны забітымі, прабітымі мячом,
якіх кладуць на камянях ямы [магільнай], як труп растаптаны.
20 Ты ня будзеш далучаны да іх у магіле, бо ты загубіў зямлю тваю, пазабіваў народ твой. Ня
будзе ўзгадвацца на вякі насеньне злачынцаў.
21 Падрыхтуйце разьню для сыноў ягоных за беззаконьне бацькоў іхніх, каб яны не паўсталі, і
ня ўзялі ў спадчыну зямлю, і не напоўнілі аблічча сусьвету гарадамі [сваімі]».
22 І Я паўстану супраць іх, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і выгублю імя Бабілону, і рэшту, і
нашчадка, і ўнука, кажа ГОСПАД.
23 І Я зраблю яго паселішчам вожыкаў і возерам водным, і вымяту яго мятлою зьнішчэньня,
кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
24 Прысягнуў ГОСПАД Магуцьцяў, кажучы: «Сапраўды, як Я задумаў, так і станецца, і што Я
вырашыў, тое споўніцца.
25 Я скрышу Асірыю на зямлі Маёй і на гарах Маіх стапчу яе. І здымецца з іх ярмо ейнае, і
цяжар ейны зваліцца з плячэй іхніх.
26 Гэта рада, якая раджаная адносна ўсёй зямлі, і гэта рука, якая выцягнутая над усімі
народамі.
27 Бо ГОСПАД Магуцьцяў вырашыў, і хто перашкодзіць? І рука Ягоная выцягнутая, і хто адверне
яе?»
28 У год сьмерці валадара Ахаза быў такі цяжар [ад Госпада]:
29 «Ня радуйся, уся [зямля] Філістынская, што зламаны дубец, які біў цябе, бо з кораня
зьмяінага выйдзе гадзюка, і плодам яе [будзе] гадзіна крылатая.
30 І будуць пасьвіцца першародныя бедных, і ўбогія адпачнуць бясьпечна, а корань твой Я
вымару голадам і выб'ю рэшту тваю.
31 Галасі, брама! Крычы, горад! Дрыжы, уся [зямля] Філістынская! Бо з поўначы прыходзіць
дым, і ніхто не адстае ад дружынаў ягоных.

32 І што адкажуць пасланцам народаў? Тое, што ГОСПАД заснаваў Сыён і ў ім маюць надзею
прыгнечаныя з народу Ягонага».

Іс 15

1 Цяжар адносна Мааву. Бо апоўначы прападзе і будзе спустошаны Ар-Мааў; бо ўначы прападзе
і будзе спустошаны Кір-Мааў.
2 Узыходзіць у сьвятыню, а Дывон — на ўзгоркі, каб плакаць; над Нэво і над Мэдэвай галосіць
Мааў. На кожнай галаве ягонай — лысіна, і кожная барада абголеная.
3 На вуліцах ягоных апранутыя ў зрэбніцу, і на дахах ягоных і на плошчах ягоных усе галосяць,
сьлязьмі заліваюцца.
4 Крычаць Хешбон і Элеале, аж у Ягацы чуцён голас іхні. Таму галосяць ваяры Мааву, і душа
ягоная ў ім млее.
5 Сэрца маё крычыць пра Мааў, уцекачы ягоныя [ідуць] аж да Цаару, да Эглят-Шэлішыі, на
ўзвышша Люхіт з плачам узыходзяць, бо на шляху ў Харанаім падымецца крык загубы!
6 Бо воды Німрыму спустошаны, бо высахла трава, зьнік мурог, зеляніны няма.
7 Дзеля таго робяць запасы, а маёмасьць пераносяць за ручай Аравім.
8 Бо крык атачае межы Мааву, аж да Эглаіму бедаваньне ягонае, і аж да Бээр-Эліму бедаваньне
ягонае.
9 Бо воды Дымону поўныя крыві, бо Я пакладу на Дымон яшчэ [ліха] — ільва на ўцекачоў з
Мааву і на рэшту зямлі.

Іс 16

1 Пашліце авечку кіраўніку краіны з Сэлі, што ў пустыні, на гару дачкі Сыёну!
2 І станецца, што як птушкі ганяныя, выкінутыя з гнязда, будуць дочкі Мааву каля бродаў праз
Арнон.
3 «Дай нам раду, выдай прысуд, палажы цень твой апоўдні нібыта ноччу, схавай выгнанцаў,
не выдавай уцекачоў.
4 Няхай абжывуцца ў цябе выгнанцы Мааву; будзь ім сховішчам перад абліччам нішчыцеля».
Бо спыніцца гвалт, скончыцца зьнішчэньне, зьнікне з зямлі той, які топча [яе].
5 І будзе ўмацаваны пасад міласэрнасьцю, і сядзе на ім у праўдзе ў намёце Давіда судзьдзя, які
будзе шукаць суду, і [будзе] спраўна [рабіць] тое, што праведна.
6 «Мы чулі пра пыхлівасьць Мааву, што ён вельмі ганарысты, і пра фанабэрыю ягоную, і пра
пыху ягоную, і пра лютасьць ягоную, і пра няшчырасьць ягоную, і пра пустыя словы ягоныя».
7 Дзеля гэтага няхай галосіць Мааў, над Маавам няхай усе галосяць; дзеля аладак з разынкамі
з Кір-Хэрэсэту няхай яны ўздыхаюць, маркотныя.
8 Бо змарнелі нівы Хешбону і вінаграднікі Сібмы. Гаспадары народаў панішчылі вінаградныя
лозы іхнія, якія сягалі аж да Язэру, даходзілі да пустыні, галіны іхнія расцягнуліся, перайшлі
праз мора.
9 Дзеля гэтага заплачу, як плача Язэр, дзеля вінаграднікаў Сібмы. Залью цябе сьлязьмі маімі,
Хешбон і Элеале, бо на жніво тваё і на збор [пладоў] тваіх прыйшоў гармідар ваенны.
10 Спынілася радасьць і вясёласьць у садах, і ў вінаграднікі ня радуюцца і не ўсклікаюць
[вясёла]. Віно ў тоўчнях не выціскае выціскальшчык, Я спыніў гоман [радасьці].
11 Дзеля таго ўнутранасьці мае стогнуць, як гусьлі, дзеля Маава, і нутро маё — дзеля Кір-
Харэсу.
12 І станецца, што [нават] калі зьявіцца Мааў, і будзе зьнясілены на ўзгорках, і прыйдзе ў
сьвятыню сваю, каб маліцца, нічога ў яго не атрымаецца.
13 Гэта слова, якое прамовіў некалі ГОСПАД супраць Мааву.
14 А цяпер прамовіў ГОСПАД, кажучы: «Праз тры гады, лічачы гадамі найміта, будзе зьня-
важаная слава Мааву разам з усім мноствам [ягоным], а рэшта ягоная будзе вельмі малая,
бясьсільная».

Іс 17

1 Цяжар адносна Дамаску. Вось, Дамаск перастане быць горадам, і станецца купай руінаў.

2 Пакінутыя будуць гарады Араэру і стануцца [выганам] для чародаў, і будуць адпачываць
[там], і ніхто ня будзе палохаць [іх].
3 І зьнікнуць гарады ўмацаваныя з Эфраіму і валадарства — з Дамаску, а рэшта Араму будзе як
слава сыноў Ізраіля, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
4 І станецца ў той дзень, што слава Якуба зьменшыцца, а тлустасьць цела ягонага схуднее.
5 І станецца так, нібыта жнец жне збожжа і рамяно ягонае зразае каласы. І станецца, нібыта
зьбіраюць каласы ў даліне Рэфаім.
6 І застанецца ў яго недазьбіранае, як бывае пры зборы алівак, дзьве або тры аліўкі на самым
версе, чатыры або пяць на галінках плодных, кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля.
7 У той дзень будзе ўглядацца чалавек на Таго, Хто зрабіў яго, і вочы ягоныя будуць глядзець
на Сьвятога Ізраіля.
8 І ня будзе ён углядацца на ахвярнікі, працу рук ягоных, і на тое, што зрабілі пальцы ягоныя,
ня будзе ён глядзець на Астартаў і на выявы сонца.
9 У той дзень умацаваныя гарады ягоныя будуць, як пакінутыя [гарады] ў лясах і на вяршынях
[гор], якія пакінулі перад сынамі Ізраіля, і будзе [там] пустэча.
10 Бо ты забыўся на Бога збаўленьня твайго і пра скалу апоры тваёй ня памятаў, і таму ты
пасадзіў сады для пацяшэньня і пасеяў вінаград чужынскі.
11 У дзень, калі ты садзіў яго, ты клапаціўся, каб яно расло і каб пасеянае табой рана
расквітнела, [але] прападзе жніво ў дзень немачы і болю невылечнага.
12 Гора! Мноства шматлікіх народаў, яны шумяць як шуміць мора. Гармідар плямёнаў, яны
бушуюць, як бушуюць воды магутныя.
13 Бушуюць плямёны, як бушуюць воды вялікія; але пасварыцца на іх [Бог], і яны ўцякуць
далёка, і будуць падхопленыя ветрам як мякіна на гарах і як [круціцца] віхор перад бурай.
14 [Прыйшоў] час вечаровы, і вось, вусьціш! І перад раніцай ужо няма яго. Гэткая доля тых,
якія нас рабавалі, такі лёс крыўдзіцеляў нашых.

Іс 18

1 Гора зямлі бразгатлівых крылаў, якая на другім баку рэкаў Кушу,
2 якая пасылае паслоў праз мора ў лайбах з трысьнёгу па абліччы вады, [кажучы]: «Ідзіце,
пасланцы шпаркія, да народу высокага і бліскучага, да народу страшнага здаўна і цяпер, да
народу дужага, які топча [ўсіх], зямлю якога перацінаюць рэкі».
3 Усе жыхары сусьвету, якія засяляюць зямлю, глядзіце, калі ўзьнімецца сьцяг на гарах, і
слухайце, калі затрубіць труба!
4 Бо гэта сказаў мне ГОСПАД: «Я буду ў супакоі і буду глядзець з месца сялібы Маёй, як цеплыня
ясная пры сьвятле [сонца], як воблака роснае ў сьпёку жніва».
5 Бо перад жнівом, калі адквітнее [вінаград] і нясьпелае станецца сьпелымі гронкамі, тады Ён
абрэжа галіны сярпом, а атожылкі абсячэ і выкіне.
6 І будуць яны пакінутыя для драпежных птушак на гарах і для скаціны на зямлі; і летам будуць
імі [жывіцца] драпежныя птушкі, а ўся скаціна зямлі будзе імі [жывіцца] зімою.
7 У той час прынясе дар для ГОСПАДА Магуцьцяў народ высокі і бліскучы, народ страшны
здаўна і цяпер, народ дужы, які топча [ўсё], зямлю якога перацінаюць рэкі, [прынясе] на месца
ГОСПАДА Магуцьцяў, на гару Сыён.

Іс 19

1 Цяжар адносна Эгіпту. Вось, ГОСПАД нясецца на лёгкім воблаку і ўваходзіць у Эгіпет.
І задрыжаць ідалы Эгіпецкія перад абліччам Ягоным, і сэрца Эгіпту растопіцца ў грудзях
ягоных.
2 І падымуцца Эгіпцяне супраць Эгіпцянаў; і будзе ваяваць кожны супраць брата свайго, і
кожны супраць бліжняга свайго, горад супраць гораду, валадарства супраць валадарства.
3 І заломіцца дух Эгіпту ў ім самім. І Я заблытаю раду ягоную, яны будуць радзіцца з ідаламі,
з духамі памёршых, з чараўнікамі і з варажбітамі.

4 І Я аддам Эгіпет у рукі гаспадара жорсткага, і валадар люты будзе панаваць над імі, кажа
Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў.
5 І зьнікне вада ў моры, і рака будзе сохнуць і высахне.
6 І засьмярдзяць рэкі, і ручаі ў Эгіпце зьмялеюць і высахнуць, а трысьнёг і чарот зьвянуць.
7 Палі пры рацэ, на берагах ракі, і ўсё пасеянае пры рацэ высахне, будзе разьвеянае і прападзе.
8 І будуць засмучаныя ўсе рыбакі, і будуць плакаць тыя, якія закідваюць вуду ў раку, а тыя,
якія ставяць нерат на абліччы вады, страцяць надзею.
9 І асаромяцца тыя, якія працуюць пры чэсаным лёне, і ткачы палотнаў зьбялеюць.
10 І будуць парваныя асновы [Эгіпту], і тыя, што працуюць за плату, будуць зьбянтэжаныя ў
душы [сваёй].
11 О, як здурнелі князі Цаану! Мудрыя даюць фараону раду недарэчную. Як вы [можаце] казаць
фараону: «Я — сын мудрацоў, сын валадароў старадаўніх»?
12 Дзе цяпер мудрацы твае? Няхай яны пакажуць табе і няхай дадуць ведаць, што вырашыў
ГОСПАД Магуцьцяў адносна Эгіпту.
13 Здурнелі князі Цаану, падманутыя князі Нофу, ашукалі Эгіпет старшыні плямёнаў ягоных.
14 ГОСПАД даў яму дух ап'яненьня, каб Эгіпет блукаў у-ва ўсіх справах сваіх, як блукае п'яніца
ў ванітах сваіх.
15 Няма ў Эгіпце такой справы, якую [могуць] зрабіць галава і хвост, пальма і чарот.
16 У той дзень станецца Эгіпет нібы жанчыны, будзе дрыжэць і будзе палохацца ад выгляду
ўзьнятай рукі ГОСПАДА Магуцьцяў, якую Ён падыме супраць іх.
17 І станецца зямля Юды жахам для Эгіпту. Кожны, хто ўзгадае пра яе, напалохаецца перад
абліччам намеру ГОСПАДА Магуцьцяў, які Ён пастанавіў супраць яго.
18 У той дзень будзе пяць гарадоў у зямлі Эгіпецкай, якія будуць гаварыць моваю ханаанскаю
і прысягаць на ГОСПАДА Магуцьцяў. Адзін з іх будзе звацца Ір-Гахерэс.
19 У той дзень будзе ахвярнік для ГОСПАДА пасярод зямлі Эгіпецкай, а слуп для [ўшанаваньня]
ГОСПАДА — на мяжы ейнай.
20 І будзе ён на знак і на сьведчаньне для ГОСПАДА Магуцьцяў у зямлі Эгіпецкай. Бо калі яны
будуць клікаць да ГОСПАДА перад абліччам прыгнятальнікаў, Ён пашле ім збаўцу, і абароніць,
і выратуе.
21 І ГОСПАД дасьць ведаць Сябе Эгіпту, і Эгіпет пазнае ГОСПАДА ў той дзень, і будуць служыць
[Яму] ахвярамі крывавымі і ахвярамі хлебнымі, і будуць складаць абяцаньні ГОСПАДУ, і
спаўняць іх.
22 І ўдарыць ГОСПАД Эгіпет плягаю, і аздаровіць; і яны навернуцца да ГОСПАДА, і Ён выслухае
іх, і вылекуе іх.
23 У той дзень будзе бітая дарога з Эгіпту ў Асірыю. І прыйдзе Асірыя ў Эгіпет, а Эгіпет — у
Асірыю, і будуць служыць [Госпаду] Эгіпет і Асірыя.
24 У той дзень Ізраіль будзе трэцім з Эгіптам і Асірыяй, дабраславеньнем пасярод зямлі,
25 бо ГОСПАД Магуцьцяў дабраславіць іх, кажучы: «Няхай будзе дабраслаўлёны народ Мой,
Эгіпет, і твор рук Маіх, Асірыя, і спадчына Мая, Ізраіль».

Іс 20

1 У год, калі Тартан прыйшоў да Ашдоду, калі паслаў яго Саргон, валадар Асірыі, і ён ваяваў
супраць Ашдоду, і здабыў яго,
2 у гэты час прамовіў ГОСПАД праз рукі Ісаі, сына Амоса, кажучы: «Ідзі і разьвяжы зрэбніцу на
сьцёгнах тваіх, і здымі сандалы твае з ног тваіх!» І ён зрабіў так, ходзячы голы і босы.
3 І сказаў ГОСПАД: «Як слуга Мой Ісая хадзіў голы і босы тры гады — [гэта] знак і цуд адносна
Эгіпту і [зямлі] Куш,
4 [што] так валадар Асірыі павядзе палонных Эгіпту і выгнанцаў Кушу, маладых і старых,
голых і босых, і з адкрытымі азадкамі. Голы [будзе] Эгіпет!
5 І спалохаюцца, і зьбянтэжацца з прычыны [зямлі] Куш, надзеі іхняй, і з прычыны Эгіпту,
пахвальбы іхняй.

6 І скажа ў той дзень жыхар узьбярэжжа: “Вось такая надзея нашая, да якой мы зьвярталіся па
дапамогу, каб выратавала нас ад аблічча валадара Асірыі! І як [цяпер] уратуемся мы самі?”»

Іс 21

1 Цяжар адносна пустыні прыморскай. Як буры налятаюць на Нэгеў, так [вораг] прыходзіць з
пустыні, з зямлі страшнай.
2 Відзеж грозны зьяўлены мне. Ліхадзей ліхадзейнічае, спусташальнік пустошыць. Элям,
выходзь! Мадай, бяры ў аблогу! Усім стагнаньням Я пакладу канец.
3 Дзеля гэтага дрыжаньнем напоўніліся сьцёгны мае, ахапілі мяне болі, як болі той, што
нараджае. Я агаломшаны ад таго, што чую, і ў трымценьні ад таго, што бачу.
4 Трымціць сэрца маё, трывога ахапіла мяне, прыцемкі, жаданыя мною, сталіся жудасьцю для
мяне.
5 Накрываюць стол, засьцілаюць абрусам, ядуць, п’юць. «Падыміцеся, князі! Памажце шчыт!»
6 Бо гэтак сказаў мне Госпад: «Ідзі, пастаў вартаўніка, каб паведаміў, што ўбачыць.
7 Калі ўбачыць ён калясьніцы, вершнікаў па два, аслоў з вазамі, вярблюдаў з вазамі, няхай
сочыць з увагай, з вялікай увагай!»
8 І ён закрычаў, [як] леў: «На вежы, Госпадзе мой, я стаю заўжды ўдзень, на варце маёй я стаю
кожную ноч.
9 І вось, едуць калясьніцы, вершнікі на конях па два. І адказаў [адзін], і сказаў: “Упаў, упаў
Бабілон, і ўсе выявы багоў ягоных [ляжаць] на зямлі пабітыя”».
10 [Народзе] мой, вымалачаны, сын току майго! Тое, што я пачуў ад ГОСПАДА Магуцьцяў, Бога
Ізраіля, я паведаміў вам!
11 Цяжар адносна Думы. Да мяне крычаць з Сэіру: «Вартаўнік, якая [гадзіна] ночы? Вартаўнік,
якая [гадзіна] ночы?»
12 Сказаў вартаўнік: «Прыходзіць раніца, але яшчэ ноч. Калі вы хочаце спытацца, пытайцеся,
вяртайцеся, прыходзьце!»
13 Цяжар адносна Арабіі. У лесе ў Арабіі начуйце, караваны Дэданцаў.
14 Насустрач спрагнёным выносьце ваду, жыхары зямлі Тэман, з хлебам сустракайце
ўцекачоў!
15 Бо яны ад аблічча мячоў уцяклі, ад аблічча мяча аголенага, ад аблічча лука напятага, ад
аблічча цяжкай вайны.
16 Бо так сказаў мне Госпад: «Яшчэ год, як год найміта, і скончыцца ўся слава Кедару.
17 А рэшта ліку лучнікаў, волатаў сыноў Кедару, будзе малая, бо ГОСПАД, Бог Ізраіля,
прамовіў!»

Іс 22

1 Цяжар адносна даліны Відзежу. Што з табой, што ты ўвесь выйшаў на дахі?
2 Поўны галасу горад шумлівы, горад вясёлы. Забітыя твае ня ўпалі ад мяча і не пагінулі на
вайне.
3 Правадыры твае ўсе разам уцяклі, зьвязаныя без [ужытку] лукаў, усе, знойдзеныя ў цябе,
разам зьвязаныя, хоць далёка яны паўцякалі.
4 Дзеля таго я сказаў: «Адвярніцеся ад мяне, я буду горка плакаць. Не спрабуйце суцешыць
мяне, бо зьнішчаная дачка народу майго».
5 Бо гэта дзень замяшаньня, стаптаньня і бязладзьдзя, [дзень] Госпада, ГОСПАДА Магуцьцяў у
даліне Відзежу, [дзень] руйнаваньня муроў і крыку на гарах.
6 Элям узяў сагайдак, на калясьніцах людзі і на конях, Кір выцягнуў шчыт.
7 І сталася, што найпрыгажэйшыя палі твае напоўніліся калясьніцамі, і вершнікі, стаючы, сталі
насупраць брамы.
8 І ўзьнялі заслону з Юды; і ты паглядзеў у той дзень на зброю ў доме кедровым.
9 І вы ўбачылі шчыліны гораду Давіда, як іх шмат, і сабралі ваду ў ніжняй сажалцы;
10 і пералічылі дамы ў Ерусаліме, і разбурылі будынкі, каб умацаваць мур,

11 і зрабілі зборнік вады між двума мурамі для вады са старой сажалкі; і не глядзелі на Таго,
Хто зрабіў усё гэта, і Таго, Хто гэтае здаўна ўкшталтаваў, ня бачылі.
12 І Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, паклікаў вас у той дзень плакаць і галасіць, і абстрыгчы
[валасы], і апрануцца ў зрэбніцу.
13 А вось, [у вас] вясёласьць і радасьць, забіваюць валоў і рэжуць бараноў, ядуць мяса і п'юць
віно: «Будзем есьці і піць, бо заўтра памром».
14 І адкрыў у вушы мае ГОСПАД Магуцьцяў: «Ня будзе адпушчана вам беззаконьне гэтае аж
пакуль не памраце, кажа Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў».
15 Так сказаў Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў: «Ідзі, увайдзі да гэтага ўрадоўца, да Шэўны, які над
домам [валадара], [і скажы]:
16 "Што ты [маеш] тут, або хто ў цябе тут, што ты высек тут сабе магілу? Ты зрабіў высока
магілу сабе і ў скале высьвідраваў пакой для сябе.
17 Вось, ГОСПАД кіне цябе, кідаючы моцна, і хапаючы, схопіць цябе,
18 і, скручваючы, скруціць цябе ў клубок, [кіне] цябе рукою, як кулю, у зямлю прасторную. Там
ты памрэш, і там [будуць] калясьніцы славы тваёй, ты — ганьба для дому гаспадара твайго.
19 І Я выганю цябе з месца твайго, і скіну цябе з пасады тваёй.
20 І станецца ў той дзень, Я паклічу слугу Майго Эліякіма, сына Хількіі,
21 і апрану яго ў адзеньне тваё, і падперажу яго поясам тваім, і ўладу тваю перадам у рукі
ягоныя, і будзе ён бацькам для жыхароў Ерусаліму і для дому Юды.
22 І Я палажу ключ дому Давіда на рамёны ягоныя, і калі ён адчыніць, ніхто не замкне, а калі
замкне, ніхто не адчыніць.
23 І Я ўваб'ю яго, як калок, у месцы вызначаным; і будзе ён пасадам славы для дому бацькі
свайго.
24 І будзе вісець на ім уся слава дому бацькі ягонага, парасткі і атожылкі, усё начыньне дробнае
ад талерак да ўсялякіх збаноў.
25 У той дзень, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, калок, убіты ў месцы вызначаным, пахісьнецца, і
зломіцца, і ўпадзе, і ўвесь цяжар, які на ім вісеў, прападзе, бо ГОСПАД прамовіў [гэта]"».

Іс 23

1 Цяжар адносна Тыру. Лямантуйце, караблі Таршышу, бо зьнішчаны дом ваш. Калі яны
вярталіся з зямлі Кіттым, аб'яўлена ім [гэта].
2 Замаўчыце, жыхары ўзьбярэжжа, купцы Сідонскія, якія падарожнічалі па моры і напоўнілі
цябе,
3 і па водах [прывозілі] насеньне Шыхору, жніво ракі [Ніл], прыбытак ягоны, які быў таварам
для народаў.
4 Засаромся, Сідон, бо сказала мора, цьвярдыня марская, кажучы: «Я ня мучылася родамі і не
нарадзіла, і не ўзгадавала юнакоў, і ня выхавала дзяўчат».
5 Калі вестка гэтая [дойдзе] да Эгіпту, яны здрыгануцца, пачуўшы пра Тыр.
6 Перапраўцеся ў Таршыш! Галасіце, жыхары ўзьбярэжжа.
7 Ці гэта ваш [горад] вясёлы, якога пачатак здаўна? Ногі нясуць яго далёка, каб пасяліцца
[там].
8 Хто пастанавіў гэта адносна Тыру, які раздаваў кароны? Купцы ягоныя былі князямі, а
гандляры ягоныя [былі] ў славе на зямлі.
9 ГОСПАД Магуцьцяў пастанавіў гэта, каб упакорыць пыху ўсякай славы і каб панізіць усіх
слаўных на зямлі.
10 Ідзі ў зямлю тваю, як рака, дачка Таршышу, бо перашкоды ўжо няма.
11 Ён выцягнуў руку Сваю над морам, затрос валадарствамі. ГОСПАД загадаў адносна Ханаану,
каб зьнішчыць цьвярдыню ягоную,
12 і сказаў: «Ня будзеш ты больш весяліцца, спаганеная дзяўчына, дачка Сідону! Устань,
перайдзі ў Кіттым, але і там ня будзеш мець супакою».

13 Вось, зямля Халдэйцаў, такога народу [ўжо] няма, Асірыя прызначыла яе для зьвяроў
пустыні. Яны збудавалі вежы свае; зруйнавалі палацы іхнія, ператварылі іх у руіну.
14 Лямантуйце, валадары Таршышу, бо спустошана цьвярдыня вашая.
15 І станецца ў той дзень, што на Тыр забудуцца на семдзясят гадоў, як дні аднаго валадара.
Калі скончацца семдзясят гадоў, станецца Тыру, як у тым сьпеве пра распусьніцу:
16 «Вазьмі гусьлі, абыйдзі горад, блудніца забытая! Зайграй прыемна, памнож сьпевы, каб
ізноў прыгадалі цябе!»
17 І станецца, калі скончацца семдзясят гадоў, ГОСПАД наведае Тыр, і ён вернецца да прыбытку
свайго, і будзе распусьнічаць з усімі валадарствамі сьвету на абліччы зямлі.
18 І станецца, што заробак ягоны і прыбытак ягоны будуць пасьвячоныя ГОСПАДУ, і ня будуць
яны зьбіраныя, і ня будуць хаваныя, бо для тых, якія жывуць перад абліччам ГОСПАДА, будзе
заробак ягоны, каб яны маглі есьці ўдосталь і апранацца раскошна.

Іс 24

1 Вось, ГОСПАД пустошыць зямлю і нішчыць яе, і руйнуе аблічча ейнае, і жыхароў ейных
расьцярушвае.
2 І што будзе з народам, тое і са сьвятаром; што са слугою, тое і з гаспадаром ягоным; што са
служкай, тое і з гаспадыняй ейнай; што з тым, хто купляе, тое і з тым, хто продае; што з тым,
хто пазычае, тое і з тым, хто дае; што з вінаватым [грошы], тое і з паверніка м, [які даў грошы]
яму.
3 Спусташэньнем будзе спустошана зямля і рабаваньнем разрабаваная, бо ГОСПАД прамовіў
гэткае слова.
4 Высахла, зьвяла зямля, змарнеў і зьвяў сусьвет, змарнелі магнаты народу зямлі.
5 І зямля апаганеная жыхарамі ейнымі, бо яны парушылі Закон, не спаўнялі пастановаў,
зламалі запавет вечны.
6 Дзеля гэтага праклён зьядае зямлю, і пакутуюць жыхары ейныя. Дзеля гэтага чэзнуць
жыхары зямлі, і засталося няшмат людзей.
7 Сумуе маладое віно, вяне вінаграднік, уздыхаюць усе, якія радаваліся ў сэрцы [сваім].
8 Заціхла вясёласьць бубнаў, змоўк гоман тых, якія весяляцца; заціхла вясёласьць гусьляў.
9 Ня п'юць са сьпевамі віна, згоркла сікера для тых, якія п'юць [яе].
10 Зруйнаваны, спустошаны горад, зачынены ўсе дамы, нельга ўвайсьці [ў іх].
11 Крык на вуліцах дзеля [нястачы] віна, зьнікла ўсякая радасьць, пайшла ў палон вясёласьць
зямлі.
12 Засталася ў горадзе [толькі] пустэча, брама разьбітая ўшчэнт.
13 Бо станецца пасярод зямлі, паміж народаў так, як пры абтрасаньні алівак, як пры зьбіраньні
[рэштак], калі скончыўся збор вінаграду.
14 Яны падымуць голас свой, будуць выслаўляць веліч ГОСПАДА, будуць голасна клікаць ад
мора.
15 Дзеля гэтага слаўце ГОСПАДА на ўсходзе, і на астравах марскіх — імя ГОСПАДА, Бога Ізраіля.
16 З канцоў зямлі мы чуем сьпяваньне: «Слава Праведнаму!» Але я сказаў: «Я гіну, я гіну, гора
мне! Ліхадзеі ліхадзейнічаюць, і, ліхадзейнічаючы, ліхадзеі ліхадзейнічаюць».
17 Страх, яма і пастка на цябе, жыхару зямлі!
18 І станецца, што той, хто ўцячэ ад крыку жаху, уваліцца ў яму, а той, хто вылезе з ямы,
трапіць у пастку, бо адчыніліся вокны нябесныя і затрэсьліся падваліны зямлі.
19 Развальваючыся, развальваецца зямля, трушчачыся, трушчыцца зямля, дрыжучы, дрыжыць
зямля.
20 Хістаючыся, хістаецца зямля, як п'яны, і гойдаецца, як калыска, цяжарам для яе стаўся грэх
ейны; яна ўпадзе і ня ўстане.
21 І станецца ў той дзень, ГОСПАД наведае войска нябеснае на вышынях і валадароў зямных
на зямлі;
22 і будуць яны зграмаджэньнем зграмаджаныя і ўвязьненыя ў яме, і будуць кінутыя ў
вязьніцу, і праз шмат дзён будуць пакараныя.

23 І месяц пачырванее, і сонца засароміцца, бо заваладарыць ГОСПАД Магуцьцяў на гары Сыён
і ў Ерусаліме, і перад старшынямі ягонымі [будзе] слава Ягоная.

Іс 25

1 ГОСПАДЗЕ, Ты — Бог мой! Я буду ўзьвялічваць Цябе і хваліць імя Тваё, бо Ты ўчыніў цуды,
выканаў намеры даўнейшыя, праўдзівыя.
2 Ты ператварыў горад у купу [друзу], горад умацаваны — у руіны; палацу чужынцаў няма
больш у горадзе, і ня будзе ён адбудаваны на вякі.
3 Дзеля гэтага будзе славіць Цябе народ моцны, горад народаў гвалтоўных будзе баяцца Цябе.
4 Бо Ты стаўся цьвярдыняй для беднага, цьвярдыняй для ўбогага ў бядзе ягонай,
прыстанішчам ад буры, ценем ад сьпёкі, бо подых моцных — як бура супраць сьцяны.
5 Як сьпёку ў пустыні, гэтак чужынцаў Ты супакоіў; як сьпёку [спыняе] цень хмары, Ты спыніў
песьню моцных.
6 І зробіць ГОСПАД Магуцьцяў на гары гэтай для ўсіх народаў гасьціну [са страваў] тлустых,
гасьціну з вінаў адборных, з тлустым шпікам і адборнымі вінамі найвыдатнейшымі.
7 І Ён зьнішчыць на гары гэтай заслону, якая закрывае ўсе плямёны, і пакрыцьцё, якое ляжыць
на ўсіх народах.
8 Будзе зьнішчана сьмерць назаўсёды, і вытра Госпад ГОСПАД сьлязу з кожнага аблічча, і
ганьбу народу Свайго здыме Ён з усёй зямлі, бо ГОСПАД прамовіў [гэта].
9 І скажуць у той дзень: «Вось, Бог наш, Той, на Якога мы спадзяваліся, і Ён збавіў нас! Гэта
ГОСПАД, на Якога мы спадзяваліся, будзем цешыцца і радавацца ў збаўленьні Ягоным!»
10 Бо супачыне рука ГОСПАДА на гары гэтай, а Мааў будзе стаптаны на месцы сваім, як топчуць
салому ў гной.
11 І выцягне ён пасярод [сябе] рукі свае, як выцягвае іх той, хто плыве, каб плысьці; і [Госпад]
упакорыць пыху ягоную разам з намаганьнямі рук ягоных.
12 І магутныя ўмацаваньні муроў тваіх Ён разваліць, пераверне і скіне на зямлю, аж у пыл.

Іс 26

1 У той дзень у зямлі Юды будуць сьпяваць гэты сьпеў: «Горад магутны ў нас! Збаўленьне Сваё
Ён даў замест муроў і валоў.
2 Адчыніце брамы! Няхай увойдзе народ праведны, які захоўвае вернасьць.
3 Таго, чые думкі скіраваныя [на Цябе], Ты захоўваеш у поўным супакоі, бо ён на Цябе
спадзяецца.
4 Спадзявайцеся на ГОСПАДА заўсёды; бо ГОСПАД, ГОСПАД — скала вечная.
5 Бо Ён упакорыў тых, якія жывуць на вышынях, панізіў горад высокі, панізіў яго аж да зямлі,
кінуў яго ў парахно.
6 Топча яго нага, [топчуць] ногі ўбогага, стопы бедных.
7 Сьцежка для праведніка простая, простыя крокі праведніка Ты робіш роўнымі.
8 І на сьцежцы судоў Тваіх, ГОСПАДЗЕ, мы маем надзею на Цябе. Да імя Твайго і памяці пра
Цябе імкнецца душа.
9 Душа мая прагне Цябе ўначы, і дух мой у нутры маім шукае Цябе, бо калі суды Твае
[адбываюцца] на зямлі, навучаюцца праведнасьці жыхары сусьвету.
10 Калі зьлітуюцца над бязбожнікам, ён не навучыцца праведнасьці, і будзе ліхадзеіць у зямлі
справядлівых і ня будзе глядзець на веліч ГОСПАДА.
11 ГОСПАДЗЕ, узнесеная рука Твая, але яны ня бачаць. Няхай убачаць і асаромяцца тыя, што
зайздросьцяць народу Твайму, і няхай агонь праглыне ворагаў Тваіх.
12 ГОСПАДЗЕ, Ты даеш супакой нам, бо ўсе справы нашыя Ты выканаў для нас.
13 ГОСПАДЗЕ, Божа наш, іншыя гаспадары, а ня Ты, панавалі над намі, але мы толькі Цябе і імя
Тваё ўзгадваем.
14 Памёршыя не ажывуць, мёртвыя не падымуцца, бо Ты пакараў іх і зьнішчыў, і сьцёр усякую
памяць пра іх.

15 Ты памножыў народ, ГОСПАДЗЕ, памножыў народ і праславіў Сябе, пашырыў усе межы
зямлі.
16 ГОСПАДЗЕ, у прыгнёце мы шукалі Цябе, маліліся ціха, калі кара Твая [была] на нас.
17 Калі цяжарная мае нарадзіць, яна крычыць і енчыць у болю сваім, так і мы сталіся перад
абліччам Тваім, ГОСПАДЗЕ!
18 Мы былі цяжарнымі і качаліся ад болю, але нарадзілі вецер, [нічога] не зрабілі для
збаўленьня зямлі, і жыхары сусьвету не адрадзіліся.
19 Ажывуць памёршыя Твае, і пазабіваныя ўваскрэснуць. Абудзіцеся і сьпявайце, вы, што
ляжыце ў парахне, бо раса Твая — раса сьвятла, і зямля аддасьць памёршых сваіх.
20 Ідзі, народзе мой, увайдзі ў пакоі свае, зачыні дзьверы свае за сабою! Схавайся на малую
хвілінку, пакуль праміне гнеў Ягоны.
21 Бо вось, ГОСПАД выходзіць з месца Свайго, каб наведаць беззаконьне жыхароў зямлі,
[кожнага] з іх. І зямля адкрые кроў, [пралітую] на ёй, і не схавае больш забітых сваіх.

Іс 27

1 У той дзень ГОСПАД наведае мячом Сваім, цяжкім і моцным левіятана, зьмея спрытнага,
левіятана, зьмея выкрутлівага, і заб'е цмока, які ў моры.
2 У той дзень [скажуць]: «Вінаграднік умілаваны, сьпявайце пра яго.
3 Я, ГОСПАД, пільную яго, паліваю яго штохвіліны, каб [ніхто] не наведаў яго, ноччу і днём
ахоўваю яго.
4 Я гневу ня маю. Калі хто Мне дасьць церне ці асот, Я выйду на вайну з ім і спалю іх [усіх]
разам.
5 Хіба што ён абапрэцца на Мяне, каб заключыць мір са Мною. Няхай мір заключыць са Мною!»
6 Прыйдзе дзень, што закарэніцца Якуб, закрасуе і разрасьцецца Ізраіль, і напоўніць аблічча
зямлі пладамі.
7 Ці ж Ён ударыў яго так, як ударыў тых, якія ўдаралі яго? Або ці забіваў яго так, як забіў тых,
якія забівалі яго?
8 Ты, выганяючы, выгнаў яго і судзішся з ім. Моцным подыхам Тваім Ты выкінуў яго, як у
дзень усходняга ветру.
9 Праз гэта будзе адпушчана беззаконьне Якуба, і плодам гэтага будзе прыбраны грэх ягоны,
калі ён возьме ўсе камяні ахвярніка [ідальскага] і раструшчыць, як камяні вапнавыя, і ня
будуць [больш] стаяць астарты і выявы сонца.
10 Бо горад умацаваны [станецца] пустэчаю, паселішчам бязьлюдным і пакінутым, як
пустыня. Там будуць пасьвіцца цяляты, і там будуць ляжаць і аб'ядаць галіны ягоныя.
11 Калі гальлё ягонае высахне, будзе адламанае, і прыйдуць жанчыны, і спаляць яго. Гэты
народ неразумны, дзеля гэтага не пашкадуе яго Той, Які зрабіў яго, і ня зьлітуецца над ім Той,
Які ўкшталтаваў яго.
12 І станецца ў той дзень, што ГОСПАД вымалаціць каласы ад ракі [Эўфрат] аж да ручая
Эгіпецкага, і вы, сыны Ізраіля, усе, што да аднаго, будзеце сабраныя.
13 І станецца ў той дзень, што затрубяць у рог вялікі, і прыйдуць тыя, якія гінулі ў зямлі
Асірыйскай, і выгнаныя ў зямлю Эгіпецкую, і будуць пакланяцца ГОСПАДУ на сьвятой гары
ў Ерусаліме.

Іс 28

1 Гора кароне пыхлівасьці п'яніцаў Эфраіма, зьвялай кветцы слаўнай аздобы ягонай, якая
[расьце] на вяршыні даліны ўрадлівай, ап'янеўшы ад віна!
2 Вось, ад ГОСПАДА [прыходзіць] дужы і магутны, як бура з градам, як ураган зьнішчальны, як
паводка залеўная, і кіне [яго] на зямлю рукою [сваёй].
3 Нагамі будзе патаптана карона пыхлівасьці п'яніцаў Эфраіма.
4 І станецца, што зьвялая кветка слаўнай аздобы ягонай, якая [расьце] на вяршыні даліны
ўрадлівай, будзе як рана [сасьпелая] фіга перад жнівом, якую, калі нехта ўбачыць, зрывае
далоняй сваёй і зьядае яе.

5 У той дзень ГОСПАД Магуцьцяў будзе каронай славы і велічнай дыядэмай для рэшты народу Свайго,
6 і духам правасудзьдзя для таго, хто сядзіць у судзе, і мужнасьцю для тых, хто адкідае [ворага] ў бітве пры браме.
7 А гэтыя блукаюць ад віна, і ад сікеры хістаюцца, сьвятар і прарок блукаюць ад сікеры, напіліся віна, хістаюцца ад сікеры, блукаюць у відзежы, спатыкаюцца ў пастановах [сваіх].
8 Бо ўсе сталы поўныя ванітаў і запэцканыя, што няма месца [чыстага].
9 Каго такі будзе вучыць веданьню? І каму будзе тлумачыць вучэньне? Дзецям, аднятым ад малака? Немаўлятам, аднятым ад грудзей?
10 Бо прыказаньне за прыказаньнем, прыказаньне за прыказаньнем, правіла за правілам, там крыху і там крыху.
11 Бо незразумелымі вуснамі і языком чужым будзе прамаўляць да народу гэтага
12 Той, Які сказаў ім: «Вось супачынак! Дайце супачыць змучанаму! Вось адпачынак!» Але яны не хацелі слухаць.
13 І было да іх слова ГОСПАДА: «Прыказаньне за прыказаньнем, прыказаньне за прыказаньнем, правіла за правілам, там крыху і там крыху», каб яны пайшлі і ўпалі на сьпіну, і разьбіліся, і каб ублыталіся, і каб былі схопленыя.
14 Дзеля гэтага паслухайце слова ГОСПАДА, людзі блюзьнерчыя, якія пануеце над народам гэтым, які [жыве] ў Ерусаліме.
15 Вы кажаце: «Мы заключылі запавет са сьмерцю і з адхланьню зрабілі дамову. Калі пройдзе біч навалы [ворагаў], ён ня дойдзе да нас, бо хлусьню мы зрабілі прыстанішчам нашым, і ў ашуканстве мы схаваліся».
16 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: «Вось, Я кладу на Сыёне камень, камень выпрабаваны, вуглавы, каштоўны, моцна ўгрунтаваны. Хто верыць у Яго, ня будзе ўцякаць.
17 І Я пастаўлю суд як мерку і праведнасьць як грунтвагу, і град зьнішчыць прыстанішча хлусьні, і схоў ейны воды затопяць.
18 І будзе разарваны запавет ваш са сьмерцю, і дамова вашая з адхланьню не ўтрымаецца. Калі пройдзе біч навалы [ворагаў], будзеце імі стаптаныя.
19 Колькі разоў пойдзе [навала], схопіць вас, бо будзе яна праходзіць кожную раніцу, і ўдзень, і ўначы, і будзеце з жахам чуць вестку [гэтую].
20 Бо надта кароткім будзе ложак, каб [на ім] выцягнуцца, і вузкім накрыцьцё, каб [ім] накрыцца.
21 Бо паўстане ГОСПАД, як на гары Перацым, як у даліне ў Гібэоне, будзе Ён гневацца, каб учыніць справу Сваю, дзіўную справу Сваю, каб выканаць работу Сваю, незвычайную работу Сваю.
22 І цяпер не насьміхайцеся, каб не заціснуліся кайданы вашыя; бо я чуў ад Госпада, ГОСПАДА Магуцьцяў, што прызначана зьнішчэньне для ўсёй зямлі.
23 Прыхіліце вуха і паслухайце голас Мой, будзьце ўважлівыя і паслухайце словы Мае!
24 Ці кожны дзень араты арэ для сяўбы, баранує і абрабляе ральлю сваю?
25 Ці ж ён, калі выраўняе аблічча ейнае, ня сее чарнуху і не рассыпае кмен? Ці ня сее ён пшаніцу і ячмень на выбраным месцы, і жыта ў межах яе?
26 І навучае яго пра такі парадак Бог ягоны, і вучыць яго.
27 Бо не малоцяць чарнухі зубцамі [жалезнымі], [колам ад возу] не качаюць па кмене, але цэпам выбіваецца чарнуха, а кмен — палкаю.
28 Ці таўкуць збожжа? Не бясконца малоціць яго малацьбіт, ён цягае па ім кола возу свайго, але коні ягоныя не таўкуць яго.
29 Гэта таксама выйшла ад ГОСПАДА Магуцьцяў, Ён даў цудоўную раду, і вялікая мудрасьць Ягоная.

Іс 29

1 Гора [табе], Арыэль, Арыэль, горад, у якім разлажыўся табарам Давід! Дадайце год да году, і ўрачыстасьці няхай скончаць свой кругабег.

2 І Я прыцісну Арыэля, і станецца смутак і стогн, і ён станецца для Мяне як вогнішча Божае.
3 І Я разлажу табар супраць цябе, атачу цябе валам, і пастаўлю супраць цябе вежы.
4 І ты будзеш паніжаны, з зямлі будзеш гаварыць, з пылу будуць гучаць словы твае, і будзе
голас твой нібы пішчаньне з зямлі, і словы твае з пылу [будуць] як мармытаньне.
5 І будзе як дробны пыл мноства ворагаў тваіх, і мноства крыўдзіцеляў тваіх — як рассыпаная
мякіна. І станецца гэта раптоўна, неспадзявана.
6 І наведае цябе ГОСПАД Магуцьцяў грымотамі, землятрусамі, гукам вялікім, бураю, віхураю
і полымем агню зьнішчальнага.
7 І будзе як сон, [як] відзеж начны, мноства ўсіх народаў, якія ваюць супраць Арыэля, і ўсе,
якія ваюць супраць яго і супраць цьвярдыні ягонай і якія прыгнятаюць яго.
8 І будзе так, як галодны сьніць, што ён есьць, і будзіцца, і пустая душа ягоная, і як сьніць
засьмягшы, што п'е, і будзіцца, і вось, ён змучаны і засьмягшая душа ягоная. Так будзе з
мноствам усіх народаў, якія ваюць супраць гары Сыён.
9 Аслупянейце і зьдзівіцеся, заляпіце сабе [вочы] і будзьце сьляпымі, ап'янейце, але не ад віна,
хістайцеся, але не ад сікеры.
10 Бо выліў на вас ГОСПАД духа сну, заплюшчыў вочы вашыя, і прарокаў, і галоваў вашых, і
відушчых зацемрыў.
11 І будзе для вас кожны відзеж як словы кнігі запячатанай, якую даюць таму, які ўмее чытаць,
кажучы: «Чытай яе», а той кажа: «Не магу, бо яна запячатаная».
12 І даюць кнігу гэтую таму, які ня ўмее чытаць, кажучы: «Чытай яе!», а ён кажа: «Я ня ўмею
чытаць».
13 І сказаў Госпад: «За тое, што народ гэты набліжаецца да Мяне [толькі] вуснамі сваімі і
славіць Мяне губамі сваімі, а сэрца ягонае далёка ад Мяне, і страх іхні перада Мною — [толькі]
прыказаньне чалавечае, якое вывучылі яны,
14 таму вось, Я зноў учыню дзіўнае з народам гэтым, робячы цуды і дзівосы. І загіне мудрасьць
мудрацоў іхніх, і разумнасьць разумных іхніх зьнікне».
15 Гора тым, якія глыбока хаваюць намеры свае перад ГОСПАДАМ, і ўчынкі іхнія схаваныя ў
цемры, і яны кажуць: «Хто бачыць нас і хто ведае пра нас?»
16 [Гэта] падступнасьць вашая! Ці можа ганчар [лічыцца] роўным з глінаю? Ці можа твор
сказаць таму, хто зрабіў яго: «Ты не зрабіў мяне»? Ці можа гаршчок сказаць ганчару свайму:
«Ты нічога не разумееш»?
17 Хіба ня ў хуткім часе Лібан пераменіцца ў сад, а сад будзе прызнаны за лес?
18 І ў той дзень глухія пачуюць словы кнігі, а вочы сьляпых, [звольненыя] ад туману і цемры,
убачаць,
19 і пакорныя павялічаць радасьць сваю ў ГОСПАДЗЕ, а ўбогія зямлі будуць цешыцца ў Сьвятым
Ізраіля.
20 Бо зьнік крыўдзіцель, і прыйшоў канец насьмешніку, і зьнішчаныя ўсе, якія ганяліся за
ліхоцьцем,
21 якія словамі схілялі чалавека да грэху, якія ў браме ставілі пастку для судзьдзяў і зводзілі
падманам праведнага.
22 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД, Які адкупіў Абрагама, да дому Якуба: «Ня будзе цяпер
асаромлены Якуб, і не зьбялее цяпер аблічча ягонае,
23 бо калі ён убачыць пасярод сябе дзяцей сваіх, справу рук Маіх, ён будзе сьвяціць імя Маё, і
будуць шанаваць Сьвятога Якуба, і будуць баяцца Бога Ізраіля.
24 І тыя, якія блукаюць духам, пазнаюць разуменьне, а тыя, якія наракаюць, навучацца
розуму».

Іс 30

1 Гора сынам непаслухмяным, кажа ГОСПАД. Вы ўчыняеце раду, але без Мяне, і заключаеце
дамовы, але не паводле Духу Майго, каб дадаць грэх да грэху!
2 Ідучы, вы зыходзіце ў Эгіпет, і не пытаецеся вуснаў Маіх, каб умацавацца ў цьвярдыні
фараона і схавацца ў ценю Эгіпту.

3 І станецца для вас сорамам цьвярдыня фараона, а хаваньне ў ценю Эгіпту — ганьбаю,
4 бо князі твае былі ў Цаане, і паслы твае дайшлі аж да Ханэсу,
5 і ўсе яны будуць асаромленыя, бо [гэты] народ ня будзе ім карысны, і не дапаможа ім, і ня дасьць прыбытку, але будзе ім на сорам і на ганьбу.
6 Цяжар адносна бегемоту паўднёвага. Праз зямлю гора і прыгнёту, адкуль ільвіца і леў, гадзюка і крылатая гадзіна, нясуць на сьпінах аслоў багацьці свае і на гарбах вярблюдаў — скарбы свае да народу, які ім ня будзе карысным.
7 Эгіпет надарма і марна [абяцае] дапамогу. Дзеля гэтага Я назваў яго “Рагаў, які ні на што няздатны”.
8 Цяпер ідзі, напішы на табліцы для іх і запішы гэта ў кнізе, каб было гэта на дзень наступны, як сьведчаньне на вякі.
9 Бо народ гэты бунтаўнічы, сыны хлусьлівыя, сыны, якія ня хочуць слухаць Закон ГОСПАДА,
10 якія кажуць відушчым: «Ня мейце відзежаў!», а прадказальнікам: «Не прадказвайце нам гэтых рэчаў справядлівых, але кажыце нам тое, што нам падабаецца, прадказвайце нам прыемнае.
11 Саступіце з дарогі, зыйдзіце са сьцежкі, прыбярыце ад аблічча нашага Сьвятога Ізраіля».
12 Дзеля гэтага так кажа Сьвяты Ізраіля: «Дзеля таго, што вы пагардзілі словам гэтым, а спадзяецеся на крыўду і здраду, і на іх вы абапіраецеся,
13 беззаконьне гэтае станецца вам як вылом [у муры], які мае ўпасьці, як схіленьне муру высокага, калі раптоўна ў момант прыходзіць падзеньне яго».
14 І Ён зруйнуе яго, як разьбіваецца гляк, зьлеплены [з гліны], разьбіваючы без шкадаваньня, і ня знойдзецца ад яго чарапку, у які можна было б узяць вугалёк з вогнішча або зачэрпнуць вады са студні.
15 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД, Сьвяты Ізраіля: «Калі вы навернецеся і будзеце ў супакоі, будзеце збаўленыя, бо ў сьцішанасьці і спадзяваньні будзе сіла вашая». Але вы не захацелі.
16 І вы сказалі: «Не, бо мы на конях уцячэм». Таму будзеце ўцякаць. «На хуткіх [калясьніцах] паімчым». Таму будуць хуткімі тыя, якія пагоняцца за вамі.
17 Тысяча [спалохаецца] пагрозы аднаго, ад пагрозы пяцёх будзеце ўцякаць, аж застанецца [рэшта] ад вас як тронак на вяршыні гары і як знак на ўзгорку.
18 Дзеля гэтага чакае ГОСПАД, каб зьлітавацца над вамі, і дзеля гэтага Ён узьнімецца, каб зьлітавацца над вамі, бо ГОСПАД — Бог правасудзьдзя. Шчасьлівыя ўсе, якія на Яго спадзяюцца.
19 Бо ты, народ на Сыёне, які жывеш у Ерусаліме, ня будзеш плакаць, бо Ён зьлітуецца над табою на голас крыку твайго; як толькі пачуе, адкажа табе.
20 І дасьць табе Госпад хлеб у прыгнёце і ваду ў бядзе, і больш не адвернецца ад цябе настаўнік твой, і вочы твае будуць бачыць настаўніка твайго.
21 І вушы твае будуць чуць за сабой слова, якое кажа: «Вось шлях, ідзіце па ім», калі ты збочыш направа ці налева.
22 І ты будзеш лічыць нячыстым срэбнае пакрыцьцё балванаў тваіх і залатое адзеньне ідалаў тваіх. Выкінеш іх як брудную анучу, і скажаш: «Прэч».
23 І Ён дасьць дождж на насеньне тваё, якое ты пасеяў на палетку тваім, і хлеб ураджаю зямлі будзе сытны і пажыўны. У той дзень чарада твая будзе пасьвіцца на пашах шырокіх.
24 Валы твае і аслы, якія абрабляюць зямлю, будуць карміцца мяшанкай сакавітай, якую правеялі лапатай і веялкай.
25 І на кожнай гары высокай, і на кожным узгорку ўзвышаным будуць ручаі і струмяні вады ў дзень вялікага бою, калі ўпадуць вежы.
26 І будзе сьвятло месяца як сьвятло сонца, а сьвятло сонца будзе сямікроць [ясьнейшае], чым сьвятло сямі дзён, у дзень, калі ГОСПАД перавяжа раны народу Свайго і загоіць сінякі ад ударaў Сваіх.
27 Вось, імя ГОСПАДА прыходзіць здалёк, палае гнеў Ягоны і ўзьнімаецца цяжка, вусны Ягоныя поўныя абурэньня, а язык Ягоны — як агонь, які [ўсё] зьядае.

28 Подых Ягоны як паводка, вір якой дасягае шыі, каб прасеяць народы сітам загубы і ўкласьці
цуглі ў пашчу народаў.
29 Сьпеў будзе ў вас як у ноч сьвяткаваньня ўрачыстасьці, і радасьць сэрца — як у таго, хто
сьпяшаецца пры гуках жалейкі на гару ГОСПАДА да Скалы Ізраіля.
30 І ГОСПАД дасьць пачуць голас Свой магутны, і моц рамяна Свайго пакажа ў выбуху гневу і
ў полымі агню, які [ўсё] зьядае, у буры і навальніцы, і ў градзе камянёў.
31 Бо ад голасу ГОСПАДА спалохаецца Асірыя і будзе дубцом пабітая.
32 І кожны ўдар кія будзе для яе карай, якую ГОСПАД спашле на яе пры граньні бубнаў і гусьляў;
і Ён будзе змагацца з ёю ў баях зацятых.
33 Бо здаўна ўжо прыгатаваны Тафэт, таксама прызначаны для валадара, глыбокі і шырокі,
вогнішча агню, і дрэва шмат; і подых ГОСПАДА, як струмень серкі, распаліць яго.

Іс 31

1 Гора тым, якія зыходзяць у Эгіпет па дапамогу. Яны абапіраюцца на коней, спадзяюцца на
калясьніцы, бо іх шмат, і на коньнікаў, бо яны вельмі моцныя, але не глядзяць на Сьвятога
Ізраіля і ГОСПАДА не шукаюць.
2 Але Ён у мудрасьці Сваёй прыводзіць ліха і слова Свайго не адменіць. І Ён паўстане супраць
дому бязбожнікаў і супраць дапамогі тых, якія робяць беззаконьне.
3 Бо Эгіпет — чалавек, а ня Бог; і коні іхнія — гэта цела, а ня дух! І ГОСПАД узьніме руку Сваю,
і спатыкнецца той, які дапамагае, і ўпадзе той, якому дапамагаюць, і ўсе яны разам загінуць.
4 Бо гэта сказаў ГОСПАД да мяне: «Як леў і львянятка вуркоча над здабычай сваёй, калі супраць
яго зьбіраецца грамада пастухоў, і ён не палохаецца голасу іхняга, не пужаецца гармідару
іхняга, так ГОСПАД Магуцьцяў зыйдзе, каб ваяваць на гары Сыён і на ўзгорку ейным.
5 Як птушкі, якія лётаюць [над гняздом], так ГОСПАД Магуцьцяў заслоніць Ерусалім,
засланяючы яго, і вызваліць, і пашкадуе, і выратуе».
6 Вярніцеся да Таго, ад Каго вы далёка адыйшліся, сыны Ізраіля!
7 Бо ў той дзень кожны адкіне ідалаў сваіх срэбных і ідалаў сваіх залатых, якіх зрабілі на грэх
рукі вашыя.
8 І ўпадзе Асірыя не ад мяча мужа, і ня меч чалавечы заб'е яе. І ўцячэ яна перад абліччам мяча,
і юнакі ейныя стануцца нявольнікамі.
9 І скала ейная ад страху ўпадзе, і князі ейныя спалохаюцца знаку [пераможцы], кажа ГОСПАД,
Які [мае] агонь на Сыёне, а печ — у Ерусаліме.

Іс 32

1 Вось, валадар будзе панаваць у праведнасьці, і князі кіраваць будуць у правасудзьдзі.
2 І будзе кожны з іх як сховішча ад ветру і як заслона ад буры, як струмяні вады ў пустыні, як
цень цяжкай скалы на зямлі спрагнёнай.
3 І ня будуць заплюшчаныя вочы тых, якія бачаць, а вушы тых, якія слухаюць, будуць чуць.
4 І сэрца лёгкадумных зразумее веданьне, а язык невымоўных будзе гаварыць выразна.
5 Дурань ня будзе ўжо называны шляхетным, і пра ашуканца ня будуць казаць як пра
дастойнага.
6 Бо дурань прамаўляе недарэчнасьці, а сэрца ягонае ўчыняе беззаконьне, каб рабіць нягоднае
і гаварыць блюзьнерства супраць ГОСПАДА, каб душу галоднага пазбавіць [хлеба] і ня даць
пітва спрагнёнаму.
7 Ашуканствы ашуканца ліхія, ён задумляе падступнае, каб загубіць бедных словамі
хлусьлівымі, калі ўбогі будзе прамаўляць пра суд.
8 А шляхетны [чалавек] думае шляхетна і сам трымаецца [рэчаў] шляхетных.
9 Жанчыны бестурботныя, устаньце, паслухайце голас Мой. Дочкі самаўпэўненыя, прыхіліце
вуха да слова Майго.
10 Праз год і некалькі дзён вы будзеце дрыжаць, самаўпэўненыя, бо скончыўся збор вінаграду,
і [другі] збор пладоў ня прыйдзе.

11 Турбуйцеся, бестурботныя, дрыжыце, самаўпэўненыя! Распраніцеся і станьце голымі,
падпержыце сьцёгны вашыя [лахманамі].
12 Біце сябе ў грудзі з прычыны поля прывабнага, з прычыны вінаградніку ўрадлівага,
13 з прычыны зямлі народу Майго, на якую зыходзяць церні і асот, з прычыны ўсіх дамоў
радасьці, з прычыны гораду вясёлага.
14 Бо палац будзе пакінуты, гоман гораду спыніцца; Афэль і вежа станецца пячорамі на вякі,
радасьцю для дзікіх аслоў і выганам для чародаў,
15 аж пакуль будзе выліты на нас Дух з вышыні. І станецца пустыня садам, а сад будзе лічыцца
лесам.
16 І будзе жыць у пустыні суд, а праведнасьць паселіцца ў садзе.
17 І будзе працаю праведнасьці мір, а плодам праведнасьці — спакой і бясьпека на вякі.
18 І будзе жыць народ Мой у сядзібе супакою і ў сялібах бясьпечных, і ў месцах супачыну
зацішных,
19 хоць будзе падаць град і паваліць лес, а горад зыйдзе ў нізіну.
20 Шчасьлівыя вы, якія сееце пры ўсіх водах, адпускаючы [на волю] ногі валоў і аслоў.

Іс 33

1 Гора табе, спусташальнік, хоць ты ня быў спустошаны; і табе, рабаўнік, хоць ты ня быў
абрабаваны. Калі скончыш пустошыць, цябе спустошаць, калі скончыш рабаваць, цябе
абрабуюць.
2 ГОСПАДЗЕ, зьлітуйся над намі, мы на Цябе спадзяемся. Будзь рамяном нашым штоpанку і
збаўленьнем нашым у час уціску.
3 На голас пагрозы [Тваёй] уцякаюць плямёны, ад вывышэньня Твайго рассыпаюцца народы.
4 Будуць зьбіраць здабычу, як зьбіраюць вусеняў, кінуцца на яе, як кідаецца саранча.
5 Узвышаны ГОСПАД, бо жыве на вышынях, Ён напоўніць Сыён судом і праведнасьцю.
6 І будзе бясьпечны час твой, багацьцем збаўленьня [будзе] мудрасьць і веданьне. Страх
ГОСПАДАЎ будзе скарбам ягоным.
7 Вось, ваяры крычаць на вуліцы, паслы міру плачуць горка.
8 Апусьцелі гасьцінцы, няма падарожных на шляхах, [вораг] зламаў запавет, зьняважыў
гарады, не зважае на чалавека.
9 Сумуе, марнее зямля, Лібан асаромлены і зьвяў, Шарон стаўся як стэп, Башан і Кармэль
павысыхалі.
10 «Цяпер Я паўстану, кажа ГОСПАД, цяпер узьнімуся, цяпер буду ўзьнесены высока.
11 Вы зачнеце сена, народзіце салому; подых ваш як агонь паглыне вас.
12 І станецца народы як паленая вапна, і як сьцятая цярніна будуць спалены ў агні.
13 Паслухайце тыя, што далёка, што Я зрабіў, і пазнайце тыя, што блізка, моц Маю!»
14 Спалохаліся грэшнікі на Сыёне, ахапіў жах крывадушнікаў: «Хто з нас вытрывае пры агні,
які [ўсё] зьядае? Хто з нас вытрывае ў полымі вечным?»
15 Хто ходзіць у праведнасьці і гаворыць праўдзіва, хто брыдзіцца прыбыткам з рабаваньня,
хто стрымлівае далоні свае, каб прымаць хабар, хто затыкае вушы свае, каб ня чуць пра
[праліцьцё] крыві, і заплюшчвае вочы, каб не глядзець на зло,
16 той будзе жыць на вышынях, і ўмацаваньні на скалах [будуць] сховішчам ягоным, будзе
дадзены яму хлеб ягоны і вада ягоная [будзе] ў яго напэўна.
17 Валадара ў прыгажосьці Ягонай убачаць вочы твае, ты будзеш глядзець на зямлю далёкую.
18 Сэрца тваё будзе ўзгадваць пра страх: «Дзе той, які лічыў? Дзе той, які важыў? Дзе той, які
аглядаў вежы?»
19 Ты больш ня ўбачыш народу нахабнага, народу з невыразнай гаворкай, якую [цяжка]
слухаць, з мовай насьмешлівай, якую [цяжка] зразумець.
20 Паглядзі на Сыён, горад урачыстасьцяў нашых! Вочы твае будуць бачыць Ерусалім, сялібу
бясьпечную, намёт, які не пахісьнецца, калкі якога ня зрушацца і вяроўкі якога не парвуцца.

21 Бо там у нас — велічны ГОСПАД замест рэкаў і каналаў шырокіх. Не плыве на іх човен на
вёслах, і вялізны карабель не праплыве.
22 Бо ГОСПАД — Судзьдзя наш, ГОСПАД — Заканадаўца наш, ГОСПАД — Валадар наш; Ён збавіць
нас.
23 Расьцягнуліся вяроўкі твае, ня могуць трымаць мачту, не напінаюць ветразя. Тады
падзеляць здабычу вялікую, кульгавыя будуць рабаваць нарабаванае.
24 І [ніводзін] жыхар ня скажа: «Я хворы». Народу, які жыве там, будуць адпушчаны
беззаконьні.

Іс 34

1 Наблізьцеся, народы, каб пачуць! І вы, плямёны, зважайце! Няхай чуе зямля і ўсё, што
напаўняе яе, сусьвет і ўсё, што ў ім жыве!
2 Бо ГОСПАД у гневе супраць усіх народаў і ў абурэньні супраць усяго войска іхняга. Ён зрабіў
іх закляцьцем і аддаў іх на загубу.
3 І забітыя іхнія будуць параскіданыя, і ад трупаў іхніх будзе ўздымацца смурод; і размокнуць
горы ад крыві іхняй.
4 І пазьнікае ўсё войска нябеснае, і скруціцца неба як [скрутак] кніжны, і ўсе зоркі іхнія
пападаюць, як падае лістота з лазы вінаграднай, і як падаюць [плады] з дрэва фігавага.
5 Бо ап'янеў на небе меч Мой. Вось, ён зыходзіць на Эдом, на народ, які Я аддаў на закляцьце,
на суд.
6 Меч ГОСПАДА поўны крыві, насычаны тлушчам, крывёй ягнятаў і казлоў, тлустасьцю нырак
бараноў, бо для ГОСПАДА ахвяра ў Боцры, разьня вялікая ў зямлі Эдом.
7 І падаюць бугаі [разам] з імі, і цяляты [разам] з быкамі, і будзе напоена зямля іхняя крывёю,
і парахно іхняе будзе насычана тлустасьцю,
8 бо [гэта] — дзень помсты ГОСПАДА, год адплаты за спрэчку супраць Сыёну.
9 І заменяцца ручаі ягоныя ў смалу, а пыл ягоны — у серку, і станецца зямля ягоная смалою,
што палае.
10 Ня згасьне яна ані ўдзень, ані ўначы, і дым ейны будзе падымацца на вякі. З пакаленьня ў
пакаленьне будзе спустошана, і на вякі вякоў ніхто праз яе ня пройдзе.
11 Пэлікан і вожык абжывуцца ў ёй, пугач і крумкач будуць жыць у ёй, і будзе расьцягнута над
ёю мерная вяроўка спусташэньня і камень [грунтвагі] зьнішчэньня.
12 Кіраўнікоў ейных ня будзе там, і не абвесьцяць валадарства, і ўсе князі ейныя будуць нічым.
13 І вырастуць церні ў палацах ейных, асот і крапіва — у замках ейных, і станецца яна сялібай
цмокаў і загарадкай для страусаў.
14 І будуць сустракацца зьвяры пустыні з шакаламі, і казёл будзе клікаць сябра свайго; там
ліліт супакоіцца і знойдзе для сябе адпачынак.
15 Там зробіць гняздо кобра, і будзе класьці яйкі, і будзе выседжваць [іх], будзе грэць іх у ценю
ейным. Там будуць каршуны зьбірацца адзін да аднаго.
16 Пашукайце ў кнізе ГОСПАДА і чытайце: «Аніводнага з іх ня будзе бракаваць, адзін аднаго ня
будзе шукаць, бо вусны [Госпада] загадалі і Дух Ягоны, Ён іх сабраў.
17 І Ён кінуў для іх жэрабя, і рука Ягоная разьдзяліла [зямлю] для іх мернай вяроўкай, і яны
ўспадкаемяць яе на вякі, і з пакаленьня ў пакаленьне будуць жыць на ёй».

Іс 35

1 Няхай весяліцца пустыня і [зямля] сухая, няхай радуецца стэп і няхай красуе як нарцыс!
2 Няхай, квітнеючы, заквітнее і няхай радуецца з ускліканьнямі і сьпяваньнем, бо слава Лібану
дадзена ёй, прыгажосьць Кармэлю і Шарону. Яны ўбачаць славу ГОСПАДА, веліч Бога нашага.
3 Умацуйце рукі зьнясіленыя і калені самлелыя зрабіце моцнымі.
4 Кажыце палахлівым сэрцам: «Будзьце моцнымі, ня бойцеся! Вось Бог ваш, помста
надыходзіць, адплата Божая. Ён Сам прыйдзе і збавіць вас».
5 Тады расплюшчацца вочы сьляпых, і вушы глухіх адкрыюцца.

6 Тады кульгавы будзе скакаць як алень, і засьпявае язык нямога, бо пацякуць воды ў пустыні
і струмяні ў стэпе.
7 І станецца выпаленая [зямля] возерам, а засьмягшая [зямля] — крыніцай вады, і ў логавішчах
цмокаў, дзе месца супачынку іхняга, вырастуць трысьнёг і чарот.
8 І будзе там гасьцінец і шлях, і назавуць яго шляхам сьвятым, і ня будзе хадзіць па ім нячысты,
і будзе ён толькі для іх, і неразумны не заблукае, калі пойдзе шляхам [гэтым].
9 Ня будзе там ільва, і драпежны зьвер ня ўзыйдзе на яго і ня знойдзецца там, але будуць
хадзіць там адкупленыя.
10 І вернуцца выбаўленыя ГОСПАДАМ, і ўзыйдуць на Сыён са сьпяваньнем, і радасьць вечная
будзе на галовах іхніх. Вясёласьць і радасьць будуць з імі, смутак і стагнаньне ўцякуць [ад іх].

Іс 36

1 І сталася ў чатырнаццатым годзе валадара Эзэкіі, пайшоў Санхерыў, валадар Асірыі, на ўсе
ўмацаваныя гарады Юды і здабыў іх.
2 І паслаў валадар Асірыі з Ляхішу Рабсака з войскам вялікім у Ерусалім да валадара Эзэкіі. І
стаў [Рабсак] пры канале верхняй сажалкі, на дарозе Поля Валюшніка.
3 І выйшлі да яго Эліякім, сын Хількіі, які [быў] загадчык палацу, і Шэўна, пісар, і Ёах, сын
Асафа, канцлер.
4 І сказаў ім Рабсак: «Скажыце Эзэкіі: “Гэта кажа валадар вялікі, валадар Асірыі. Што гэта за
надзея, на якую ты спадзяешся?
5 Няўжо ты думаеш, што словы вуснаў [заменяць] раду і сілу для вайны? На каго ты спадзяешся
цяпер, што збунтаваўся супраць мяне?
6 Вось, ты спадзяешся на Эгіпет, на гэтую трысьціну паламаную, якая, калі хто на яе абапрэцца,
убіваецца ў далонь і прабівае яе. Такі фараон, валадар Эгіпту, для ўсіх, якія на яго спадзяюцца.
7 А калі ты скажаш мне: “На ГОСПАДА, Бога нашага, мы спадзяемся”, дык ці ж Ён ня той,
якога вышыні і ахвярнікі пазносіў Эзэкія і сказаў Юдзе і Ерусаліму: “Перад гэтым [толькі]
ахвярнікам будзеце пакланяцца”?
8 А цяпер заключы дамову з гаспадаром маім, валадаром Асірыі, і я дам табе дзьве тысячы
коней, калі зможаш знайсьці для іх вершнікаў.
9 Як ты прагоніш хоць аднаго з найменшых слугаў гаспадара майго? А ты спадзяваўся на
Эгіпет, што атрымаеш калясьніцы і коней!
10 І цяпер, ці ж не бяз [волі] ГОСПАДА я прыйшоў у зямлю гэтую, каб зьнішчыць яе. ГОСПАД
сказаў мне: “Выйдзі супраць зямлі гэтай і зьнішчы яе”».
11 І сказалі Эліякім, Шэўна і Ёах Рабсаку: «Гавары да слугаў тваіх па-арамейску, бо мы
разумеем, не гавары да нас па-юдэйску ў вушы людзей, якія на мурах».
12 І сказаў Рабсак: «Ці ж да гаспадара твайго і да цябе паслаў мяне гаспадар мой, каб прамовіць
словы гэтыя? Ці ж не да людзей, якія сядзяць на мурах і будуць есьці лайно сваё і піць ваду
ног сваіх з вамі?»
13 І стаў Рабсак, і закрычаў моцным голасам па-юдэйску, і сказаў: «Слухайце словы валадара
вялікага, валадара Асірыі!
14 Гэта кажа валадар. Няхай не падманвае вас Эзэкія, бо ён ня можа выратаваць вас.
15 Няхай не абнадзейвае вас Эзэкія ГОСПАДАМ, кажучы: “Ратуючы, выратуе нас ГОСПАД, і
горад гэты ня будзе аддадзены ў рукі валадара Асірыі”.
16 Ня слухайце Эзэкіі, бо так кажа валадар Асірыі: “Заключыце са мною мір і выйдзіце да мяне,
і будзеце есьці кожны [плады] вінаградніку свайго і дрэва фігавага свайго, і будзеце піць ваду,
кожны са студні сваёй,
17 аж пакуль я не прыйду і не вазьму вас у зямлю, [падобную] да зямлі вашай, зямлю збожжа
і маладога віна, зямлю хлеба і вінаграднікаў”.
18 Толькі няхай вас не падманвае Эзэкія, кажучы: “ГОСПАД выратуе нас”. Ці ж богі народаў
выратавалі кожны зямлю сваю ад рукі валадара Асірыі?
19 Дзе богі Хамату і Арпаду? Дзе богі Сэфарваіму? Ці выратавалі яны Самарыю ад рукі маёй?

20 Хто з усіх багоў гэтых земляў уратаваў зямлю сваю ад рукі маёй? Дык ці ж уратуе ГОСПАД
Ерусалім ад рукі маёй?”»
21 І яны маўчалі, і не адказалі яму ані слова, бо так загадаў ім валадар і сказаў: «Не адказвайце
яму!»
22 І прыйшлі Эліякім, сын Хількіі, які быў [загадчык] палацу, і Шэўна, пісар, і Ёах, сын Асафа,
канцлер, да Эзэкіі, разьдзёршы шаты, і пераказалі яму словы Рабсака.

Іс 37

1 І сталася, калі пачуў [гэта] валадар Эзэкія, разьдзёр шаты свае, апрануўся ў зрэбніцу і пайшоў
у Дом ГОСПАДА.
2 І паслаў ён Эліякіма, які быў [загадчык] палацу, і Шэўну, пісара, і старэйшых сьвятароў,
апранутых у зрэбніцу, да прарока Ісаі, сына Амоса,
3 і яны сказалі яму: «Гэта кажа Эзэкія: “Дзень гэты — дзень гора, і кары, і ганьбы, бо прыйшлі
сыны, каб нарадзіцца, але няма сілы, каб нарадзіць.
4 Можа, ГОСПАД, Бог твой, пачуе словы Рабсака, якога паслаў валадар Асірыі, гаспадар ягоны,
каб зьневажаць Бога Жывога, і ГОСПАД, Бог твой, пакарае яго за словы, якія чуў? А ты ўзьнясі
малітву за рэшту, якая яшчэ засталася”».
5 І прыйшлі слугі валадара Эзэкіі да Ісаі.
6 І сказаў ім Ісая: «Гэта скажыце гаспадару вашаму: “Так кажа ГОСПАД. Ня бойся словаў, якія
ты чуў, якімі слугі валадара Асірыі зьневажалі Мяне.
7 Вось, Я спашлю на яго духа, і ён пачуе вестку, і вернецца ў зямлю сваю, і Я ўдару яго мячом
у зямлі ягонай”».
8 І вярнуўся Рабсак, і знайшоў валадара Асірыі, які здабываў Лібну, бо пачуў, што ён адыйшоў
з-пад Ляхішу.
9 І пачуў [валадар], што сказалі пра Тыргака, валадара Кушу: «Ён выйшаў ваяваць супраць
цябе». І ён пачуў гэта, і паслаў пасланцоў да Эзэкіі, кажучы:
10 «Гэта скажыце Эзэкіі, валадару Юды: “Няхай ня зводзіць цябе Бог твой, на Якога ты
спадзяешся, кажучы: “Ня будзе аддадзены Ерусалім у рукі валадара Асірыі”.
11 Вось, ты чуў, што зрабілі валадары Асірыі з усімі землямі, прызначаючы іх на загубу, а ты ці
зможаш захавацца?
12 Ці выратавалі богі тых народаў, якія зьнішчылі бацькі мае, Газан, Харан, Рэцэф і сыноў
Эдэну, якія ў Тэлясары?
13 Дзе валадар Хамату і валадар Арпаду, і валадар гарадоў Сэфарваіму, Гэны і Іввы?”»
14 І ўзяў Эзэкія ліст гэты з рук пасланцоў, і прачытаў яго, і ўвайшоў у Дом ГОСПАДА, і разгарнуў
яго перад абліччам ГОСПАДА.
15 І маліўся Эзэкія да ГОСПАДА, кажучы:
16 «ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, Які сядзіш на херувімах! Ты — адзіны Бог над усімі
валадарствамі зямлі, Ты стварыў неба і зямлю.
17 Нахілі, ГОСПАДЗЕ, вуха Тваё і пачуй; адкрый, ГОСПАДЗЕ, вочы Твае і пабач! І выслухай усе
словы Санхерыва, якія ён паслаў, каб зьневажаць Бога Жывога!
18 Праўда, ГОСПАДЗЕ, што валадары Асірыі зьнішчылі ўсе народы і землі іхнія.
19 У агонь яны кінулі багоў іхніх, бо яны не былі багамі, але творамі рук чалавечых, дрэвам і
камянём, і зьнішчылі іх.
20 А цяпер, ГОСПАДЗЕ, Божа наш, збаў нас ад рукі ягонай, і няхай ведаюць усе валадары зямлі,
што Ты, ГОСПАДЗЕ, — адзіны Бог!»
21 І паслаў Ісая, сын Амоса, да Эзэкіі, кажучы: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля: “[Я пачуў тое],
пра што ты маліўся да Мяне адносна Санхерыва, валадара Асірыі”.
22 Вось слова, якое прамовіў ГОСПАД пра яго: “Насьміхаецца з цябе, пагарджае табою
дзяўчына, дачка Сыёну. За табою ківае галавой дачка Ерусаліму.
23 Каго зьневажаў ты і на Каго блюзьніў? Супраць Каго падняў ты голас і ўверх узьняў вочы
твае? Супраць Сьвятога Ізраілева!

24 Праз рукі слугаў тваіх ты зьневажаў Госпада і казаў: “З мноствам калясьніцаў маіх я
ўзыйшоў на горы высокія, на схілы Лібану, і выразаў гонкія кедры ягоныя, і найпрыгажэйшыя
кіпарысы ягоныя, і дайшоў аж да вяршыняў ягоных, у нетры садоў ягоных.
25 Я капаю [студню] і п’ю ваду, і высушваю стопамі ног маіх усе рэкі Эгіпецкія”.
26 Хіба ты ня чуў, што даўно Я зрабіў гэта, у дні старадаўнія Я прызначыў гэта, а цяпер
зьдзяйсняю, што ты нішчыш гарады ўмацаваныя, ператвараючы іх у купу друзу.
27 Жыхары іхнія [маюць] рукі слабыя, [яны] стрывожаныя і зьбянтэжаныя; і сталіся як сена ў
полі, як зеляніна маладая і як трава на даху, спаленая перш, чым сасьпела.
28 Ці ты сядзіш, ці выходзіш, ці ўваходзіш — Я ведаю, і [ведаю] злоснасьць тваю адносна Мяне.
29 За тое, што ты злуешся на Мяне і што пыха твая дайшла да вушэй Маіх, Я ўкладу кальцо Маё
ў ноздры твае і цуглі Мае ў рот твой, і выведу цябе на дарогу, па якой ты прыйшоў”.
30 А для цябе, [Эзэкія], такі знак: “Ешце ў гэтым годзе тое, што засталося ад сабранага [зерня],
а ў другі год — тое, што само вырасьце, а ў трэці год сейце і зьбірайце, садзіце вінаграднікі і
ешце плады іхнія.
31 І тое, што застанецца з дому Юды, пусьціць корань у глыб і дасьць плод угару.
32 Бо з Ерусаліму выйдзе рэшта, і збаўленыя — з гары Сыён. Рэўнасьць ГОСПАДА Магуцьцяў
зробіць гэта”.
33 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра валадара Асірыі: “Ня ўвойдзе ён у горад гэты, і ня
выпусьціць ён туды стралы; і не наставіць супраць яго шчыт, і не насыпле кругом яго валу.
34 Шляхам, якім ён прыйшоў, вернецца, і ў горад гэты ня ўвойдзе, кажа ГОСПАД.
35 Я абараню горад гэты і выратую яго дзеля Сябе і дзеля Давіда, слугі Майго”».
36 І выйшаў анёл ГОСПАДА, і забіў у табары Асірыйцаў сто восемдзясят пяць тысячаў [чалавек].
І ўсталі раніцаю, і вось, усе яны мёртвыя.
37 І Санхерыў, валадар Асірыі, сабраў [табар] і адыйшоў, і вярнуўся, і затрымаўся ў Ніневе.
38 І сталася, калі ён пакланяўся ў доме Нісроха, бога свайго, Адрамэлех і Шарэцэр, сыны
ягоныя, забілі яго мячом і ўцяклі ў зямлю Арарат. І сын ягоны Эсар-Хадон заваладарыў пасьля
яго.

Іс 38

1 У тыя дні захварэў Эзэкія сьмяротна. І прыйшоў да яго прарок Ісая, сын Амоса, і сказаў яму:
«Гэта кажа ГОСПАД: “Дай загад пра дом твой, бо ты паміраеш і ня будзеш жыць”».
2 І павярнуў Эзэкія аблічча сваё да сьцяны, і маліўся да ГОСПАДА,
3 і казаў: «О, ГОСПАДЗЕ, узгадай, што я хадзіў перад абліччам Тваім у праўдзе і са шчырым
сэрцам і рабіў тое, што добрае ў вачах Тваіх». І плакаў Эзэкія плачам вялікім.
4 І было слова ГОСПАДА да Ісаі, кажучы:
5 «Ідзі і скажы Эзэкіі: “Гэта кажа ГОСПАД, Бог Давіда, бацькі твайго. Я пачуў малітву тваю,
убачыў сьлёзы твае. Вось, Я дадам да дзён тваіх пятнаццаць гадоў,
6 і выратую ад рукі валадара Асірыі цябе і горад гэты, і абараню горад гэты.
7 І гэта вось будзе табе на знак ад ГОСПАДА, што ГОСПАД выканае слова гэтае, якое Ён прамовіў.
8 Вось, Я вярну цень [сонечны] на дзесяць прыступак [гадзіньніка] Ахаза, па якіх сонца ўжо
зыйшло па прыступках”». І вярнулася сонца на дзесяць прыступак, па якіх [ужо] зыйшло.
9 Напісанае Эзэкіем, валадаром Юды, калі ён быў захварэў і акрыяў ад хваробы сваёй:
10 «Я сказаў: “У палове дзён маіх мушу ісьці да брамы апраметнай, я пазбаўлены рэшты гадоў
маіх”.
11 Я сказаў: “Я ня ўбачу ГОСПАДА, ГОСПАДА ў зямлі жывых; і ня буду больш бачыць чалавека
сярод тых, што жывуць у сьвеце”.
12 Жытло маё разабрана і перанесена [далёка] ад мяне, як намёт пастухоў. Я зьвіваю, як ткач,
жыцьцё маё; як нітку ад асновы Ён адрывае мяне, з дня да ночы Ён сканчвае [жыцьцё] маё.
13 Я крычаў аж да раніцы. Як леў Ён скрышыў усе косткі мае. З дня да ночы Ён сканчвае
[жыцьцё] маё.

14 Я пішчу як ластаўка, як журавель, уздыхаю як галубка, стаміліся вочы мае, [углядаючыся]
ўгору. ГОСПАДЗЕ, я прыгнечаны, паручыся за мяне!
15 Што я маю сказаць? Ён што сказаў, тое і ўчыніў мне! Буду паволі ісьці праз усе гады мае ў
горычы душы маёй.
16 ГОСПАДЗЕ, гэтым жывуць [людзі] і ў-ва ўсім гэтым — жыцьцё духа майго. Аздараві мяне і
ажыві мяне!
17 Вось, супакоем [зрабіў] горыч маю вялікую. Ты вырваў душу маю з ямы загубы, і кінуў за
сьпіну Тваю ўсе грахі мае.
18 Бо не апраметная будзе славіць Цябе, і сьмерць ня будзе хваліць Цябе. Ня маюць надзеі на
вернасьць Тваю тыя, што зыходзяць у магілу.
19 Жывы, [толькі] жывы будзе славіць Цябе, як я сёньня. Бацька сынам паведаміць пра
вернасьць Тваю.
20 ГОСПАД збавіў мяне! І пад граньне музыкаў мы будзем сьпяваць усе дні жыцьця нашага ў
Доме ГОСПАДА».
21 І сказаў Ісая: «Няхай возьмуць аладку з фігаў і пакладуць на скулу, і ён ачуняе».
22 І сказаў Эзэкія: «Які знак, што я ўвайду ў Дом ГОСПАДА!»

Іс 39

1 У той час Мэрадах-Баладан, сын Баладана, валадар Бабілону, паслаў да Эзэкіі лісты і дары,
бо ён пачуў, што той быў хворы і ачуняў.
2 І ўсьцешыўся з іх Эзэкія, і паказаў ім дом скарбаў сваіх: срэбра, золата, пахошчы, каштоўны
алей і ўсе каморы свае, і ўсё, што знаходзілася ў сховішчах ягоных. Не засталося рэчы, якой
бы не паказаў ім Эзэкія ў доме сваім і ў-ва ўсім валоданьні сваім.
3 І прыйшоў Ісая прарок да валадара Эзэкіі і сказаў яму: «Што сказалі людзі гэтыя і адкуль яны
прыйшлі да цябе?» І сказаў Эзэкія: «З зямлі далёкай яны прыйшлі да мяне, з Бабілону».
4 І сказаў [Ісая]: «Што бачылі яны ў доме тваім?» І сказаў Эзэкія: «Усё, што ёсьць у доме маім,
яны бачылі. Не было рэчы, якой я не паказаў бы ім у сховішчах».
5 І сказаў Ісая Эзэкіі: «Паслухай слова ГОСПАДА Магуцьцяў:
6 “Вось, прыйдуць дні, і будзе забрана ўсё, што ёсьць у доме тваім і што назьбіралі бацькі твае
аж да сёньняшняга дня, у Бабілон, і не пакінуць нічога, кажа ГОСПАД.
7 А сыноў тваіх, якія выйдуць з цябе, якіх ты народзіш, забяруць, і яны будуць эўнухамі ў
палацы валадара Бабілону”».
8 І сказаў Эзэкія Ісаі: «Добрае слова ГОСПАДА, якое ты прамовіў». І сказаў: «Бо будуць супакой
і бясьпека ў дні мае».

Іс 40

1 Пацяшайце, пацяшайце народ Мой, кажа Бог ваш.
2 Прамаўляйце да сэрца Ерусаліму і клічце да яго, што скончылася ліхая доля ягоная, што
прабачанае беззаконьне ягонае, бо ён атрымаў з рукі ГОСПАДА падвойную [кару] за ўсе грахі
свае.
3 Голас таго, хто кліча: «У пустыні рыхтуйце шлях ГОСПАДУ, прастуйце ў стэпе сьцежкі Богу
нашаму.
4 Кожная даліна няхай падымецца, і кожная гара і ўзгорак няхай будуць паніжаныя; і стануцца
дарогі простымі, а няроўныя [шляхі] — гладкімі.
5 І зьявіцца слава ГОСПАДА, і ўбачыць яе кожнае цела, бо вусны ГОСПАДА прамовілі [гэта]».
6 Голас кажа: «Крычы!» А я сказаў: «Што маю крычаць?» Усякае цела — трава, і ўся слава
ягоная — як кветка палявая.
7 Высыхае трава, вяне кветка, бо вецер ГОСПАДА падзьмуў на яе. Сапраўды, народ — як трава.
8 Высыхае трава, вяне кветка, але слова Бога нашага трывае на вякі.
9 Узыйдзі на высокую гару, дабравесьнік Сыёну! Узьнімі з [усёй] сілы голас твой, ты,
дабравесьнік Ерусаліму! Узьнімі [голас], ня бойся, кажы гарадам Юды: «Вось Бог ваш!»

10 Вось, Госпад ГОСПАД прыходзіць з моцай, рамяно Ягонае мае ўладу. Вось, нагарода Ягоная
з Ім разам і плата Ягоная — перад абліччам Ягоным.
11 Як пастыр Ён пасьвіць статак Свой, і зьбірае рамяном Сваім ягнятаў, і носіць іх на грудзях
Сваіх, і котных [авечак] гоніць паціху».
12 Хто зьмераў жменяй сваёй воды, і хто неба зьмераў пядзяй сваёй? Хто трацінай меркі
памераў пыл зямлі? Хто ўзважыў на вагах горы, а на шалях — узгоркі?
13 Хто ўзважвае Дух ГОСПАДА? І які чалавек Яму даваў параду сваю?
14 З кім Ён раіўся і хто настаўляў Яго, і хто вучыў Яго сьцежцы суду, і вучыў Яго веданьню, і
шляху розуму навучаў Яго?
15 Вось, народы — як кропля з вядра, і лічацца як пыл на шалях. Вось, астравы важаць як
парушынка.
16 І Лібану ня хопіць на вогнішча, а зьвяроў ягоных ня хопіць на цэласпаленьне.
17 Усе народы перад Ім як нішто, яны ў Яго лічацца за марноту і пустку.
18 Да каго падобным зробіце Бога? Які вобраз надасьцё Яму?
19 Ідала вырабляе разьбяр, і залатар золатам пакрывае яго, і ланцужкі срэбраныя
[прымацоўвае] залатар.
20 А хто бедны, бярэ дрэва, якое не гніе, шукае спраўнага майстра, каб зрабіў ідала, які не
пахісьнецца.
21 Ці ж вы ня ведаеце? Ці ж вы ня чулі? Ці ж вам не было паведамлена ад пачатку? Ці ж вы не
зразумелі падвалінаў зямлі?
22 Ён — Той, Які сядзіць па-над скляпеньнем зямлі, і жыхары ейныя — як саранча [перад Ім];
Ён расьцягнуў, як ветразь, нябёсы, і напяў іх як намёт, каб жыць у ім.
23 Ён — Той, Які магнатаў робіць нічым, судзьдзяў зямлі робіць марнасьцю.
24 Ледзь яны пасаджаныя, ледзь пасеяны, ледзь камель іхні закараніўся ў зямлі, як Ён дыхнуў
на іх, і яны павысыхалі, і віхор панёс іх як салому.
25 «І да каго вы прыраўняеце Мяне, каб быў Я роўны [яму]?» — кажа Сьвяты.
26 Узьніміце вочы вашыя ўгору і паглядзіце. Хто стварыў [зоркі гэтыя]? Той, Які выводзіць
шыхтамі войска іхняе і кліча ўсіх іх на імя. Дзеля такой вялікасьці моцы і велізарнай
магутнасьці аніводная ня згубіцца.
27 Чаму ты кажаш, Якуб, і гаворыш, Ізраіль: «Схаваны шлях мой перад ГОСПАДАМ, і суд мой
адыйшоў ад Бога майго»?
28 Ці ты ня ведаеш? Або ты ня чуў? Бог Вечны, ГОСПАД, Які стварыў канцы зямлі, Ён ня слабне
і не стамляецца, і недасьледная мудрасьць Ягоная!
29 Ён дае змучанаму сілу, а зьнямогламу павялічвае моц.
30 Юнакі слабнуць і стамляюцца, і хлопцы спатыкаюцца і падаюць,
31 а тыя, якія спадзяюцца на ГОСПАДА, аднаўляюць сілы, узьнімаюць крылы, як у арла, будуць
бегчы, і ня стомяцца, і будуць хадзіць, і не саслабеюць.

Іс 41

1 Маўчыце перада Мною, астравы! Няхай народы адновяць сілы свае. Няхай наблізяцца і
прамовяць: «Станем разам на суд!»
2 Хто абудзіў праведніка з усходу, паклікаў ногі ягоныя [ісьці], перад абліччам ягоным
перамог народы і падпарадкаваў валадароў? Меч ягоны сьцірае іх у парахно, лук ягоны
разносіць іх, як салому.
3 Ён гоніць іх, ідзе спакойна дарогаю, па якой ніколі не хадзілі ногі ягоныя.
4 Хто ўчыніў і зьдзейсьніў гэта? Той, Які кліча пакаленьні здаўна. Я, ГОСПАД, — першы, і сярод
апошніх Я такі Самы.
5 Убачылі астравы і спалохаліся, і канцы зямлі затрымцелі. Яны набліжаюцца і прыходзяць.
6 Кожны дапамагае бліжняму свайму і кажа брату свайму: «Будзь моцны!»
7 І ўмацоўвае майстар залатара, той, які б'е молатам, — таго, які куе на кавадле, і кажа пра
злучэньне: «Добрае яно», і ўмацоўвае цьвікамі, каб не хісталася.

8 А ты, Ізраіль, слуга Мой, Якуб, якога Я выбраў, насеньне Абрагама, сябра Майго,
9 ты, якога Я ўзяў з канцоў зямлі, і з ускраін ейных паклікаў цябе, і сказаў табе: «Ты — слуга
Мой, Я выбраў цябе і не адкінуў цябе».
10 Ня бойся, бо Я з табою, не азірайся [па баках], бо Я — Бог твой! Я ўмацую цябе і дапамагу
табе, і падтрымаю цябе правіцай праведнасьці Маёй.
11 Вось, асаромяцца і будуць у ганьбе ўсе, якія злуюцца на цябе, і стануцца як нішто, і загінуць
усе, якія спрачаюцца з табою.
12 Будзеш шукаць іх і ня знойдзеш тых, якія варагуюць з табою, і стануцца як нішто і загінуць
тыя, якія ваююць з табою.
13 Бо Я — ГОСПАД, Бог твой, Які трымае цябе за правую руку тваю і кажа табе: «Ня бойся, Я
дапамагаю табе.
14 Ня бойся, чарвяк Якуб, жменька Ізраіль. Я дапамагаю табе, кажа ГОСПАД, і Адкупіцель твой
— Сьвяты Ізраіля».
15 Вось, Я перамяню цябе ў малатарню новую, вострую, зубчастую, і будзеш ты малаціць і
трушчыць горы, і ўзгоркі сатрэш у мякіну.
16 Ты перасееш іх, і вецер разгоніць іх, і віхура разьвее іх, а ты будзеш радавацца ў ГОСПАДЗЕ і
будзеш хваліцца Сьвятым Ізраіля.
17 Бедныя і ўбогія шукаюць вады, але няма яе, і язык іхні высах ад смагі. Я, ГОСПАД, выслухаю
іх, і [Я], Бог Ізраіля, не пакіну іх!
18 Я адкрыю на голых скалах рэкі і пасярод далінаў — жаролы [вады]; і перамяню пустыню ў
возера водаў, а сухую зямлю — у крыніцы водныя.
19 І Я пасаджу ў пустыні кедры, акацыі, мірты і дрэвы аліўныя, і пастаўлю ў стэпе разам
кіпарыс, явар і бук,
20 каб убачылі і даведаліся, разгледзелі і зразумелі, што рука ГОСПАДА зрабіла ўсё гэта, і
Сьвяты Ізраіля стварыў гэта.
21 Прадстаўце судовую справу вашую, кажа ГОСПАД. Прывядзіце доказы свае, кажа Валадар
Якуба.
22 Няхай наблізяцца і паведамяць Нам, што будзе. Распавядзіце пра мінуўшчыну, якая яна
была, і Мы возьмем [гэта] да сэрца Нашага, і пазнаем канец ейны, альбо [распавядзіце] пра
будучыню, каб Мы пачулі.
23 Распавядзіце, што мае стацца ў будучыні, і Мы зразумеем, ці вы — богі. Зрабіце добрае або
зрабіце ліхое, каб Мы зьдзівіліся і ўбачылі [ўсе] разам.
24 Вось, вы — нішто, і праца вашая — нішто; гідота — той, хто вас выбірае.
25 Я пабудзіў [мужа] з поўначы, і ён прыйшоў з усходу сонца, і ён будзе клікаць імя Маё і будзе
таптаць магнатаў як балота, як ганчар месіць гліну.
26 Хто паведаміў [гэта] ад пачатку, каб мы ведалі, і [паведаміў] раней, каб мы сказалі:
«Слушна»? Але ніхто не паведаміў, ніхто не абвяшчаў, ніхто ня чуў словаў вашых.
27 Я ад пачатку [сказаў] Сыёну: «Вось яно», і для Ерусаліму даў дабравесьніка.
28 І Я глядзеў, і не было нікога, нікога, здатнага да рады, каб спытаць іх і атрымаць слова.
29 Вось, усе яны — падман, і ўчынкі іхнія — марнасьць, і ідалы іхнія — вецер і пустэча.

Іс 42

1 Вось, Слуга Мой, Якога Я трымаю, выбраны Мой, у Якім мае ўпадабаньне душа Мая. Я ўсклаў
Дух Мой на Яго, і Ён дасьць суд народам.
2 Ён ня будзе крычаць і ня ўзьніме [голас], і ня будзе чуцён голас Ягоны на вуліцах.
3 Трысьціны надламанай ня зломіць, і лёну, які дыміцца, не патушыць. Ён прынясе суд у
праўдзе.
4 Ён ня стоміцца і не зьняможацца, аж пакуль не ўстановіць на зямлі суд, і на Закон Ягоны
чакаюць астравы.
5 Гэта кажа Бог, ГОСПАД, Які стварыў неба і расьцягнуў яго, Які ўмацаваў зямлю і тое, што
вырастае з яе, Які даў дыханьне людзям на ёй і духа [ўсім] тым, якія ходзяць па ёй.

6 Я, ГОСПАД, паклікаў Цябе ў праведнасьці, і Я буду трымаць Цябе за руку Тваю і ахоўваць Цябе,
і Я пастаўлю Цябе як запавет для народу, як сьвятло для паганаў,
7 каб адкрыць вочы сьляпым, і вывесьці з няволі вязьняў і з вязьніцы тых, якія сядзяць у цемры.
8 Я — ГОСПАД, гэта імя Маё; і славы Маёй Я не аддам іншаму, і хвалы Маёй — ідалам.
9 Вось, [прадказаныя] раней [падзеі] прыйшлі, і новыя Я паведамлю; перш, чым яны
зьдзейсьняцца, Я дам пачуць вам [пра іх].
10 Сьпявайце ГОСПАДУ сьпеў новы, хвалу Ягоную — з канцоў зямлі. Няхай шуміць мора і ўсё,
што ў ім, астравы і жыхары іхнія.
11 Няхай радуецца пустыня і гарады ейныя, паселішчы, у якіх жыве Кедар! Няхай гамоняць
радасна жыхары Сэлі, з вяршыняў гор няхай усклікаюць.
12 Няхай аддаюць славу ГОСПАДУ і хвалу Ягоную абвяшчаюць на астравах!
13 ГОСПАД прыходзіць, як волат і як ваяр, выклікае на бой, узьнімае кліч, гукае пераможна над
ворагамі Сваімі.
14 Я маўчаў ад вякоў, стрымліваўся, цярпеў; [цяпер] буду крычаць, як тая, якая нараджае, буду
стагнаць і глытаць паветра.
15 Спустошу горы і ўзгоркі, і высушу ўсю зеляніну іхнюю, і перамяню рэкі ў астравы, а азёры
высушу.
16 І Я павяду сьляпых па шляху, якога ня ведаюць, і па сьцежках, якіх ня ведаюць, дам ім
хадзіць. І перамяню цемру перад абліччам іхнім у сьвятло, і крывыя шляхі выпрастую. Гэтыя
ўсе словы Я споўню і не пакіну іх.
17 Павернуцца назад і засаромяцца сорамам тыя, якія спадзяваліся на ідалаў, якія казалі
балванам: «Вы — богі нашыя».
18 Глухія, слухайце, і вы, сьляпыя, углядайцеся, каб бачыць!
19 Хто так сьляпы, як слуга Мой, і так глухі, як пасланец Мой, якога Я пасылаю? Хто сьляпы,
як дасканалы [Мой]? І хто сьляпы, як слуга ГОСПАДА?
20 Ты бачыў шмат, але не зважаў; меў адкрытыя вушы, але ня чуў.
21 ГОСПАД захацеў дзеля праведнасьці Сваёй узьвялічыць Закон і праславіць [яго].
22 Але гэты народ абрабаваны і спустошаны, усе яны ў пячорах зьвязаныя і ў вязьніцах
замкнёныя; сталіся здабычай, і няма каму выратаваць; яны спустошаныя, і няма каму сказаць:
«Аддай!»
23 Хто з вас паслухае гэта, зьверне на гэта ўвагу і пачуе пра будучыню?
24 Хто аддаў Якуба на рабаваньне, і Ізраіль — на спусташэньне? Хіба ня ГОСПАД, супраць Якога
мы грашылі, і не хацелі хадзіць шляхамі Ягонымі, і ня слухалі Закону Ягонага?
25 І Ён выліў на яго жар гневу Свайго і жахі вайны; і палала вакол яго, але ён не пазнаў [гэтага];
і паліла яго, але ён ня браў [гэтага] да сэрца.

Іс 43

1 І цяпер гэтак кажа ГОСПАД, Які стварыў цябе, Якуб, і зьляпіў цябе, Ізраіль: «Ня бойся, бо Я
адкупіў цябе і паклікаў імя тваё, ты — Мой.
2 Калі будзеш праходзіць праз воды, Я з табой, і калі [пойдзеш] праз рэкі, яны не затопяць цябе.
Калі пойдзеш праз агонь, не згарыш, і полымя не праглыне цябе.
3 Бо Я — ГОСПАД, Бог твой, Сьвяты Ізраіля, Збаўца твой! Я даў Эгіпет на водкуп за цябе, Куш і
Сэву замест цябе.
4 Праз тое, што ты стаўся ў вачах Маіх дарагім і слаўным і Я люблю цябе, Я аддам людзей замест
цябе і народы за душу тваю.
5 Ня бойся, бо Я з табою! З усходу прывяду насеньне тваё і з захаду пазьбіраю цябе.
6 Скажу поўначы: «Аддай!», і поўдню: «Ня стрымлівай! Прывядзі сыноў Маіх здалёк, і дочак
Маіх з канцоў зямлі,
7 і ўсіх, хто завецца імем Маім і каго Я стварыў дзеля славы Маёй, укшталтаваў і зьляпіў.
8 Выведзі народ сьляпы, хоць ён мае вочы, і глухі, хоць вушы [ёсьць] у яго».

9 Няхай усе народы зьбяруцца разам, і зыйдуцца плямёны. Хто з іх распавядзе пра гэта? Няхай
аб'явяць пра мінулае. Няхай дадуць сведкаў сваіх і апраўдаюцца, каб можна было пачуць і
сказаць: «[Гэта] праўда!»
10 Вы — сьведкі Мае, кажа ГОСПАД, і слуга Мой, якога Я выбраў, каб вы даведаліся і верылі Мне,
і зразумелі, што гэта Я. Да Мяне не было Бога і пасьля Мяне ня будзе.
11 Я, Я — ГОСПАД, і акрамя Мяне няма Збаўцы.
12 Я абвясьціў і збавіў, і даў пачуць; і няма ў вас іншага [Бога], і вы — сьведкі Мае, кажа ГОСПАД,
што Я — Бог.
13 Ад дзён [вечнасьці] Я — Той Самы, і няма нікога, хто з рукі Маёй можа выратаваць! Я
зьдзейсьніў, і хто можа зьмяніць гэта?
14 Гэта кажа ГОСПАД, Адкупіцель ваш, Сьвяты Ізраіля: «Дзеля вас Я паслаў у Бабілон і сабраў
усіх уцекачоў, а Халдэйцы на караблях крык [узьнімуць].
15 Я — ГОСПАД, Сьвяты ваш, Творца Ізраіля, Валадар ваш».
16 Гэта кажа ГОСПАД, Які адкрыў шлях праз мора і сьцежку праз воды бурлівыя,
17 Які вывеў калясьніцу і коньніка, дружыну і дужага, і яны разам паляглі і не падняліся,
згарэлі, як кнот, які тухне.
18 Але вы ня ўзгадвайце пра мінулае і пра старадаўняе не разважайце.
19 Вось, Я раблю новае, цяпер яно вырастае. Ці ж вы гэтага ня ведаеце? Вось, Я раблю шлях у
пустыні, а рэкі — у стэпе.
20 Будуць славіць Мяне звяры палявыя, цмокі і страусы, бо Я даў ваду ў пустыні, і рэкі ў стэпе,
каб напаіць народ Мой, выбраны Мой.
21 Народ гэты Я ўкшталтаваў для Сябе, ён будзе абвяшчаць хвалу Маю.
22 Але ты ня клікаў Мяне, Якуб, і ты, Ізраіль, не высіляўся дзеля Мяне.
23 Не ахвяроўваў ты Мне ягня на цэласпаленьне і ахвярамі крывавымі тваімі не ўслаўляў Мяне.
24 Не купляў ты Мне пахкага трысьнёгу за срэбра і тлустасьцю ахвяраў тваіх не насычаў Мяне.
Але ты турбаваў Мяне грахамі тваімі і мучыў Мяне беззаконьнямі тваімі.
25 Я, Я — Той, Які сьцірае правіны твае адносна Мяне, і ня памятае грахоў тваіх.
26 Узгадай Мяне, будзем судзіцца разам, расказвай, каб апраўдацца табе.
27 Бацька твой першым саграшыў, пасярэднікі твае адступіліся ад Мяне.
28 І Я зганьбіў князёў сьвятыні [тваёй], і аддаў Якуба на закляцьце [зьнішчэньня], а Ізраіля —
на зьнявагу.

Іс 44

1 А цяпер паслухай, Якуб, слуга Мой, і ты, Ізраіль, якога Я выбраў.
2 Гэта кажа ГОСПАД, Які зрабіў цябе і ўкшталтаваў цябе ад улоньня [маці], Які дапамагае табе:
«Ня бойся, слуга Мой, Якуб, і Ешурун, якога Я выбраў.
3 Бо Я выльлю воды на спрагнёнае і струмяні — на [зямлю] сухую. Я выльлю Духа Майго на
насеньне тваё і дабраславенства Маё — на нашчадкаў тваіх.
4 І будуць яны расьці між травы, як вербы пры цячэньні водаў.
5 Адзін скажа: "Я — ГОСПАДАЎ", а другі назавецца імем Якуба, іншы напіша на руцэ сваёй "Для
ГОСПАДА", і назавецца імем Ізраіля».
6 Гэта кажа ГОСПАД, Валадар Ізраіля і Адкупіцель ягоны, ГОСПАД Магуцьцяў: «Я — першы, і Я
— апошні, і акрамя Мяне няма Бога.
7 Хто як Я? Няхай акажацца, няхай абвесьціць, няхай раскажа Мне, як Я заснаваў народ у
[часах] старадаўніх, і тое, што здарыцца, што мае быць, няхай паведаміць Нам.
8 Ня бойцеся і не трывожцеся. Ці ж не здаўна Я распавёў табе і абвясьціў? І вы — сьведкі Мае.
Ці ж ёсьць Бог акрамя Мяне? Няма [іншай] скалы, ніякай ня ведаю».
9 Усе разьбяры ідалаў — марнота; і ўлюблёныя [ідалы] іхнія не прыносяць ім карысьці, і яны
[самі] сьведкі [гэтага]. Яны ня бачаць, і ня ведаюць [нічога], і таму будуць асаромленыя.
10 Хто лепіць бога і выразае ідала, каб ня мець ад іх карысьці?

11 Вось, усе ўдзельнікі гэтага будуць асаромленыя; а майстры іхнія — яны [толькі] людзі.
Няхай яны зыйдуцца ўсе і стануць, і разам усе спалохаюцца і асаромяцца.
12 Каваль [вырабляе] з жалеза сякеру, працуе на вугольлі, і малатком кшталтуе [ідала], і робіць
работу моцным рамяном сваім; адчувае голад, стамляецца, ня п'е вады і зьнемагаецца.
13 Цясьляр на дрэве расьцягвае [меральны] шнур, выразае рыльцам [ідала], выдзёўбвае
долатам і крэсьліць цыркулем, і робіць яго на падабенства чалавека, чалавека прыгожага, каб
паставіць яго ў доме.
14 Насёк для сябе кедраў і ўзяў кіпарыс і дуб, якія выбраў сабе між дрэваў у лесе. Пасадзіў
ясень, і дождж вырошчвае [яго].
15 І будзе [гэта] для чалавека на сагравaньне, і ён бярэ [частку] з іх, і грэецца, і распаліць
[агонь], і пячэ хлеб. А з рэшты робіць бога і пакланяецца [яму], робіць ідала і кленчыць перад
ім.
16 Палову [дрэва] спальвае ў агні, і на палове яго пячэ мяса; есьць сьпечанае, і насычаецца, і
грэецца, і кажа: «Як я сагрэўся і гляджу на агонь».
17 А з рэштак робіць бога, ідала для сябе, перад якім кленчыць, якому пакланяецца, і моліцца
да яго, кажучы: «Ратуй мяне, бо ты — бог мой!»
18 Такія [нічога] ня ведаюць і не разумеюць, бо заплюшчаныя вочы іхнія, каб ня бачыць, і
[зачыненае] сэрца іхняе, каб не разумець.
19 Не застанаўляюцца яны ў сэрцы сваім, няма [ў іх] веданьня і разуменьня, каб сказаць:
«Палову я спаліў у агні і сьпёк на вугольлі ягоным хлеб для сабе, і сьпёк мяса, і зьеў, а з рэшты
няўжо я зраблю брыдоту і буду пакланяцца кавалку дрэва?»
20 Такі вось корміцца попелам, сэрца падманутае зьвяло яго, і ня выратуе ён душы сваёй, і ня
скажа: «Ці ж не падман я трымаю ў правай руцэ маёй?»
21 Памятай пра гэта, Якуб, і ты, Ізраіль, бо ты — слуга Мой, Я ўкшталтаваў цябе, ты — слуга
Мой, Ізраіль, не забывайся пра Мяне.
22 Я разьвеяў, як хмару, правіны твае, і грахі твае — як воблака. Вярніся да Мяне, бо Я адкупіў
цябе!
23 Радуйцеся, нябёсы, бо ГОСПАД зрабіў гэта; усклікайце, глыбіні зямлі! Радасна гукайце, горы
і лес, і ўсе дрэвы ў ім, бо ГОСПАД адкупіў Якуба і праславіўся ў Ізраілі.
24 Гэта кажа ГОСПАД, Адкупіцель твой, Які ўкшталтаваў цябе ад улоньня [маці]: «Я — ГОСПАД,
Які зрабіў усё, Які Сам расьцягнуў неба і ўмацаваў зямлю. І хто [тады] быў са Мною?
25 Я зьнішчаю знакі брахлівых і выяўляю дурасьць прадказальнікаў, адсылаю назад мудрацоў
і веданьне іхняе ператвараю ў глупоту.
26 Я сьцьвярджаю слова слугі Майго, і выконваю раду пасланцоў Маіх. Я кажу Ерусаліму: "Ты
будзеш заселены!", і гарадам Юды: "Вы будзеце адбудаваныя, і руіны вашыя Я аднаўлю".
27 Я кажу бездані: "Высахні, і Я высушу рэкі твае".
28 Я кажу пра Кіра: "Пастыр Мой", і ён выканае ўсю волю Маю і скажа Ерусаліму: "Ты будзеш
адбудаваны!", а сьвятыні: "Ты будзеш закладзена!"»

Іс 45

1 Гэта кажа ГОСПАД да памазанца Свайго Кіра: «Я моцна трымаю цябе за правую руку тваю,
каб скарыць перад абліччам тваім народы і зьняць паясы са сьцёгнаў валадароў, каб адчыніць
перад абліччам тваім дзьверы і каб брамы не былі зачынены.
2 Я пайду перад абліччам тваім, і зраўняю ўзвышанае, і дзьверы мядзяныя разаб'ю, і засаўкі
жалезныя паламаю.
3 І дам табе скарбы, якія ў цемры, і багацьці схаваныя, каб ты ведаў, што Я — ГОСПАД, Які
паклікаў цябе імем тваім, Бог Ізраіля.
4 Дзеля слугі Майго Якуба і дзеля Ізраіля, выбранца Майго, Я назваў цябе імем тваім, вызначыў
цябе, хоць ты ня ведаеш Мяне.
5 Я — ГОСПАД, і няма іншага. Акрамя Мяне няма Бога. Я падперазаў цябе, хоць ты ня ведаеш
Мяне,

6 каб ведалі ад усходу сонца аж да захаду, што акрамя Мяне няма нічога. Я — ГОСПАД, і няма
іншага.
7 Я ўкшталтаваў сьвятло і стварыў цемру, раблю мір і ствараю ліхоту. Я — ГОСПАД, Які робіць
усё гэта».
8 Крапіце, нябёсы, з гары, і з хмараў няхай ліецца праведнасьць, няхай раскрыецца зямля і
вырасьціць збаўленьне; і няхай праведнасьць вырасьце разам [з ім]. Я, ГОСПАД, стварыў гэта.
9 Гора таму, хто спрачаецца з Творцам сваім, чарапок паміж чарапкоў зямных! Ці кажа гліна
ганчару: «Што ты робіш?», або ці кажа выраб [майстру]: «Ты ня маеш рук»?
10 Гора таму, хто кажа бацьку: «Навошта ты нарадзіў [мяне]?», або маці: «Навошта ты
нарадзіла [мяне]?»
11 Гэта кажа ГОСПАД, Сьвяты Ізраіля і Творца ягоны: «Вы пытаеце Мяне пра будучыню сыноў
Маіх і загадваеце Мне пра творы рук Маіх?
12 Я зрабіў зямлю, і чалавека на ёй Я стварыў, рукі Мае расьцягнулі неба, і Я загадваў усяму
войску ягонаму.
13 Я падняў яго ў праведнасьці і ўсе шляхі ягоныя раўняю. Ён адбудуе горад Мой і вызваліць
палонных Маіх, бяз выкупу і без аднагараджэньня, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
14 Гэта кажа ГОСПАД: «Праца Эгіпту і прыбытак Кушу, і Савейцы, людзі высокія, пяройдуць
да цябе і будуць тваімі; яны пойдуць за табой, пойдуць у кайданах, будуць пакланяцца табе і
ўмольваць цябе: “Толькі ў цябе ёсьць Бог, і няма іншага”».
15 Сапраўды, Ты — Бог таямнічы, Бог Ізраіля, Збаўца!
16 Зьніякавеюць і асаромяцца ўсе разам, і пойдуць у ганьбе тыя, якія робяць выявы [ідалаў].
17 Ізраіль будзе збаўлены ГОСПАДАМ збаўленьнем вечным. Ня будзеце вы асаромленыя і ня
будзеце зьняважаныя на вякі вечныя.
18 Бо гэта кажа ГОСПАД, Творца неба, Ён — Бог, Які ўкшталтаваў зямлю і зрабіў яе, Ён умацаваў
яе, Ён стварыў яе, каб не была пустэчай, але ўкшталтаваў яе для пражываньня: «Я — ГОСПАД,
і няма іншага».
19 Не прамаўляў Я патаемна ў цёмным закутку зямлі, не казаў Я насеньню Якуба: «Дарэмна
вы шукаеце Мяне». Я — ГОСПАД, Які гаворыць пра праведнасьць, абвяшчае справядлівасьць.
20 Зьбярыцеся і прыходзьце, наблізьцеся разам, выратаваныя з народаў. Ня ведаюць [нічога]
тыя, якія носяць драўлянага ідала свайго і моляцца да бога, які ня можа збавіць.
21 Распавядзіце і наблізьцеся, і будзем радзіцца разам. Хто расказаў пра гэта здаўна, і хто
распавёў пра гэта раней? Ці ж ня Я, ГОСПАД? Бо няма іншага Бога акрамя Мяне, Бога
праведнага і Таго, Хто збаўляе. Няма іншага апрача Мяне.
22 Павярніцеся да Мяне і будзеце збаўленыя, усе канцы зямлі, бо Я — Бог, і няма іншага.
23 Я прысягнуў на Самога Сябе, з вуснаў Маіх выйшла праведнасьць, слова, якое не вяртаецца,
бо перада Мною схіліцца кожнае калена і [Мною] будзе прысягаць кожны язык.
24 «Толькі ў ГОСПАДЗЕ, — скажуць пра Мяне, — праведнасьць і сіла! Да Яго прыйдуць і будуць
асаромлены ўсе, якія працівяцца Яму».
25 У ГОСПАДЗЕ будзе апраўдана і ўслаўлена ўсё насеньне Ізраіля.

Іс 46

1 Упаў Бэль, сагнуўся Нэво. Сталіся ідалы іхнія для зьвяроў і для скаціны. Тое, што насілі вы
[на руках], палажылі як цяжар на змучаную [жывёлу].
2 Разам яны пазгіналіся і паваліліся, не змаглі вытрымаць цяжару, і душы іхнія пайшлі ў палон.
3 Паслухайце Мяне, дом Якуба і ўся рэшта дому Ізраіля, якіх Я ўзяў ад улоньня [маці], насіў
[на руках] ад нараджэньня.
4 І да вашай старасьці Я — Той Самы, і да сівізны Я буду трымаць вас; Я зрабіў [вас], і Я буду
насіць [вас], буду трымаць і збаўляць.
5 Да каго падобным і роўным вы зробіце Мяне? І з кім Мяне параўнаеце і да каго ўпадобніце?
6 Тыя, што выцягваюць золата з капшука і срэбра важаць на вагах, наймаюць залатара, каб
зрабіў бога, і кленчаць перад ім, і пакланяюцца яму,

7 падымаюць яго на плечы і носяць, і стаўляюць яго на месцы ягоным; і ён стаіць, і з месца
свайго ня рухаецца, а калі хто кліча яго, не адказвае і ад бяды не ратуе.
8 Памятайце пра гэта і будзьце дарослымі! Вазьміце гэта да сэрца, адступнікі!
9 Памятайце пра [падзеі] мінулыя, адвечныя, бо Я — Бог, і няма іншага Бога, няма падобнага
да Мяне.
10 Я прадказваю ад пачатку тое, што мае быць, і наперад — тое, што [яшчэ] ня сталася. Я кажу:
«Рада Мая зьдзейсьніцца, і Я выканаю ўсю волю Маю».
11 Я клічу з усходу птушку драпежную, і з зямлі далёкай — чалавека, [які выканае] раду Маю.
Што Я прамовіў, тое і споўню, і што вырашыў, тое і зраблю.
12 Слухайце Мяне, цьвёрдыя сэрцам, далёкія ад праведнасьці!
13 Я наблізіў праведнасьць Маю, яна ўжо недалёка, і збаўленьне Маё не замарудзіць, і Я дам на
Сыёне збаўленьне, і Ізраілю — славу Маю.

Іс 47

1 Зыйдзі і сядзь у пыл, дзяўчына, дачка Бабілону! Сядзь на зямлі, без пасаду, дачка Халдэйцаў!
Бо ты больш ня будзеш называцца чульлівай і далікатнай.
2 Вазьмі жорны і мялі муку, і здымі вэлюм твой, падкашы сукенку, адкрый ногі, пераходзь
праз рэкі.
3 І будзе адкрыты сорам твой, і ўбачаць ганьбу тваю! Я адпомшчу і не пашкадую нікога.
4 Адкупіцель наш, ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае, Сьвяты Ізраіля [кажа].
5 Сядзь моўчкі і ўвайдзі ў цемру, дачка Халдэйцаў, бо не назавуць цябе больш гаспадыняй над
валадарствамі.
6 Я загневаўся на народ Мой, апаганіў спадчыну Маю і аддаў іх у руку тваю, а ты не зьявіла ім
ласкі, над старымі вельмі зацяжэла ярмо тваё.
7 Ты казала: «Вечна я буду гаспадыняй», і не ўяўляла ў сэрцы тваім гэтага, і не нагадвала сабе
пра канец твой.
8 А цяпер паслухай гэта, прыгажуня, якая жывеш у бясьпецы, якая кажаш у сэрцы сваім:
«[Толькі] я, і акрамя мяне [няма] нікога, не застануся ўдавой і не зазнаю сіроцтва!»
9 Але прыйдзе да цябе і тое, і іншае. Раптам, у адзін дзень і сіроцтва, і ўдоўства зваляцца на
цябе, нягледзячы на мноства чараваньняў тваіх, нягледзячы на моц мноства заклёнаў тваіх.
10 Бо ты спадзявалася на злоснасьць тваю і казала: «Ніхто ня ўбачыць мяне». Мудрасьць твая
і веданьне тваё падманулі цябе, і ты сказала ў сэрцы тваім: «Я, і больш ніхто!»
11 Таму прыйдзе на цябе гора, і ня будзеш ведаць заклёну супраць яго, і спадзе на цябе бяда, і
ня зможаш пазьбегнуць яе, і прыйдзе на цябе раптам зьнішчэньне, пра якое ня ведаеш.
12 Заставайся з заклёнамі тваімі і з мноствам чараваньняў тваіх, у якіх практыкавалася ад
юнацтва твайго. Можа, будзеш мець з іх карысьць, а можа, напалохаеш [каго].
13 Ты стамілася ад мноства дарадцаў тваіх. Няхай стануць і ратуюць цябе тыя, якія мераюць
неба і глядзяць за зоркамі, і прадказваюць на кожны месяц, што мае прыйсьці да цябе.
14 Вось, яны сталіся, як салома, агонь спаліць іх, і ня выратуюць яны душы сваёй ад рукі агню;
бо гэта ня жар, якім грэюцца, гэта ня вогнішча, каб сядзець пры ім.
15 Такімі стануць для цябе тыя, з якімі ты працавала, якія атачалі цябе ад юнацтва твайго.
Кожны будзе блукаць у свой бок, і ніхто не ўратуе цябе.

Іс 48

1 Слухайце гэта, дом Якуба, якія называецеся імем Ізраіля і якія выйшлі з водаў Юды, якія
прысягаеце ў імя ГОСПАДА і Бога Ізраіля ўзгадваеце, [хоць] ня ў праўдзе і ня ў праведнасьці.
2 Бо вы ад горада сьвятога называецеся і абапіраецеся на Бога Ізраіля, ГОСПАД Магуцьцяў —
імя Ягонае.
3 Пра мінулае Я здаўна паведаміў вам, з вуснаў Маіх яно выйшла, і Я абвяшчаў пра яго, і раптам
зрабіў гэта, і яно сталася.
4 Я ведаў, што ты ўпарты, і што карак твой жалезны, а лоб твой — мядзяны.

5 І Я прадказваў табе даўно, перш чым споўнілася гэта, расказаў табе, каб ты не сказаў: «Ідал
мой зрабіў гэта, і адліты ідал мой і рэзьблены ідал мой загадалі гэта».
6 Ты чуў і бачыў усё гэта, хіба цяпер не прызнаеш [гэта]? А цяпер Я абвяшчаю табе новае і
таемнае, чаго ты ня ведаеш.
7 Цяпер яно створана, а не здаўна і не за дзень, і ты ня чуў пра гэта, каб ты не сказаў: «Вось, я
ведаў гэта».
8 Ты нічога ня чуў, і нічога ня ведаў, і здаўна не адкрылася [гэта] для вуха твайго, бо Я ведаў,
што ты здраднікам і бунтаўніком называешся ад улоньня [маці].
9 Дзеля імя Майго Я стрымаю гнеў Мой і дзеля хвалы Маёй стрымаю Сябе, каб ня зьнішчыць
цябе.
10 Вось, Я ператапіў цябе, але ня як срэбра, Я выспрабаваў цябе ў печы нядолі.
11 Дзеля Сябе, дзеля Сябе Самога Я раблю [гэта], каб не было зьняважана [імя Маё]. І славы
Маёй Я не аддам другому.
12 Слухай Мяне, Якуб, і Ізраіль, якога Я паклікаў. Гэта Я, Я — першы, і Я — апошні.
13 Рука Мая заснавала зямлю, і правіца Мая расьцягнула неба. Я клічу іх, і яны становяцца
разам.
14 Зьбярыцеся ўсе і слухайце. Хто з вас распавёў пра гэта? ГОСПАД любіць [яго], і ён выканае
волю Ягоную ў Бабілоне, і рамяно Ягонае — на Халдэйцах.
15 Я, Я прамовіў [гэта] і паклікаў яго, прывёў яго і даў посьпех шляху ягонаму.
16 Наблізьцеся да Мяне і паслухайце гэта. Спрадвеку Я не гаварыў патаемна. Ад часу, калі гэта
дзеялася, Я быў там. І цяпер Госпад ГОСПАД паслаў Мяне і Дух Ягоны.
17 Гэта кажа ГОСПАД, Адкупіцель твой, Сьвяты Ізраіля: «Я — ГОСПАД, Бог твой, Які вучыць цябе
карыснаму, Які вядзе цябе на шляху, па якім ідзеш.
18 Калі б ты зважаў на прыказаньні Мае, стаўся б супакой твой, як рака, і праведнасьць твая —
як хвалі марскія.
19 І было б насеньне тваё, як пясок, а нашчадкі ўлоньня твайго — як зярняткі пяску, і не было
б зьнішчанае і сьцёртае імя тваё перад абліччам Маім!»
20 Выходзьце з Бабілону, уцякайце ад Халдэйцаў! З гоманам радасьці абвяшчайце, няхай
чуюць гэта, разьнясіце гэта аж да краю зямлі, кажыце: «ГОСПАД адкупіў слугу Свайго Якуба».
21 Ня смагнулі яны, калі Ён вёў іх праз пустыні. Ён вывеў ім ваду са скалы, рашчапіў скалу, і
пацякла вада.
22 Няма супакою для бязбожнікаў, кажа ГОСПАД.

Іс 49

1 Паслухайце Мяне, астравы, зважайце, далёкія народы! ГОСПАД паклікаў Мяне з улоньня
[маці], ад чэрава маці Маёй Ён узгадаў імя Маё.
2 І зрабіў Ён вусны Мае, як меч востры; у ценю рукі Сваёй схаваў Мяне. І зрабіў Ён з Мяне стралу
вострую, і схаваў Мяне ў сагайдаку Сваім.
3 І сказаў Мне: «Ты — слуга Мой, Ізраіль, у Табе Я праслаўлюся».
4 А Я сказаў: «Надарма Я працаваў, на пустое і марнае выдаткаваў Я сілу Маю. Аднак суд Мой
у ГОСПАДА, і ўзнагарода Мая — у Бога Майго».
5 І цяпер кажа ГОСПАД, Які ўкшталтаваў Мяне ад улоньня [маці] на слугу Сабе, каб навярнуць
Якуба да Сябе і каб Ізраіль для Яго быў сабраны. І Я праслаўлены ў вачах ГОСПАДА, і Бог Мой
стаўся моцай Маёй.
6 І Ён сказаў: «Замала таго, каб Ты быў для Мяне слугою, каб аднавіць калены Якуба і
каб вярнуць выратаваных Ізраіля, але Я пастаўлю Цябе Сьвятлом для народаў, каб быў Ты
збаўленьнем Маім аж да краю зямлі».
7 Гэта кажа ГОСПАД, Адкупіцель Ізраіля, Сьвяты ягоны, да пагарджанай душы, да Таго, Якім
брыдзяцца народы, да Слугі тых, што пануюць: «Валадары ўбачаць Цябе, і паўстануць князі і
паклоняцца дзеля ГОСПАДА, бо Ён верны, і [дзеля] Сьвятога Ізраіля, Які выбраў Цябе».

8 Гэта кажа ГОСПАД: «У час ласкі Я адказаў Табе, і ў дзень збаўленьня Я дапамог Табе, і Я
захаваю Цябе, і пастаўлю Цябе запаветам для народу, каб аднавіць зямлю, каб разьдзяліць
спадчыну спустошаную,
9 каб сказаць вязьням: “Выходзьце!”, а тым, якія ў цемры: “Зьявіцеся!” Яны будуць пасьвіцца
на ўсіх дарогах, на ўсіх лысых узгорках будзе паша іхняя.
10 Ня будуць яны галадаць і ня будуць смагнуць, і ня ўдарыць іх сьпёка і сонца, бо Той, Які
шкадуе іх, будзе весьці іх, і да крыніцаў водных павядзе іх.
11 Я зраблю ўсе горы Мае дарогаю, і сьцежкі Мае будуць узьнятыя.
12 Вось, тыя прыходзяць здалёк, а вось гэтыя — з поўначы і з захаду, а іншыя — з зямлі Сінім.
13 Радуйцеся, нябёсы, і весяліся, зямля! Гукаючы, гукайце, горы, ад радасьці! Бо пацешыў
ГОСПАД народ Свой і зьлітаваўся над убогім Сваім.
14 А Сыён казаў: «Пакінуў мяне ГОСПАД, Госпад мой забыўся пра мяне!»
15 Ці ж забудзецца жанчына пра немаўля сваё, каб не пашкадавала сына ўлоньня свайго? Але
[нават] калі яна забудзецца, Я не забудуся пра цябе!
16 Вось, Я запісаў цябе на далонях Маіх, муры твае перада Мною заўсёды.
17 Сьпяшаюцца тыя, якія будуюць цябе, а тыя, якія руйнавалі цябе і спусташалі цябе, адыйдуць
ад цябе.
18 Падымі навокал вочы свае і паглядзі! Усе яны сабраліся і ідуць да цябе. Як жывы Я, кажа
ГОСПАД, усіх іх ты ўзложыш [на сябе], як аздобу, і будзеш падвязаная імі як нявеста.
19 Бо руіны твае і спусташэньне тваё, і зямля зьнішчэньня твайго цяпер будзе цеснай для
жыхароў, і адыйдуць далёка тыя, якія руйнавалі цябе.
20 Зноў скажуць у вушы твае сыны сіроцтва твайго: «Цеснае для мяне месца гэта, дай мне
прастор, каб я мог пасяліцца».
21 І ты скажаш у сэрцы сваім: «Хто нарадзіў мне іх? Бо я была бязьдзетная і няплодная,
выгнаная і заведзеная ў няволю. Дык хто выгадаваў іх? Вось, я засталася самотнай, а яны
адкуль узяліся?»
22 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: «Вось, Я падыму руку Маю да народаў, і да плямёнаў уздыму
сьцяг Мой, і панясуць сыноў тваіх на руках, а дочкі твае будуць несены на плячах.
23 І будуць валадары выхавацелямі тваімі, а валадаркі іхнія — карміцелькамі тваімі. Абліччам
да зямлі будуць пакланяцца табе і будуць лізаць пыл ног тваіх, і ты даведаешся, што Я —
ГОСПАД, і ня будуць асаромлены тыя, якія спадзяюцца на Мяне».
24 Ці ж можна забраць у волата здабычу, або ці палоненыя пераможцам могуць быць
выратаваныя?
25 Бо гэта кажа ГОСПАД: «Нават палоненыя волатам будуць забраныя [ў яго], і здабыча
прыгнятальніка будзе выратаваная. Я буду змагацца з супраціўнікам тваім, і сыноў тваіх Я
збаўлю.
26 І Я прымушу крыўдзіцеляў тваіх есьці цела сваё, і ўласнай крывёю яны нап’юцца, быццам
маладым віном. І даведаецца кожнае цела, што Я — ГОСПАД, Збаўца твой і Адкупіцель твой,
Моцны Якуба».

Іс 50

1 Гэта кажа ГОСПАД: «Дзе ліст разводны маці вашай, з якім Я адаслаў яе? Або хто пазыкадавец
Мой, якому Я прадаў вас? Вось, за правіны вашыя былі вы прададзеныя, і за злачынствы вашыя
адасланая маці вашая.
2 Чаму, калі Я прыйшоў, не было нікога? Я клікаў, і ніхто не адказваў? Ці ж кароткай стала рука
Мая, каб вызваляць? Ці ж ня маю Я сілы, каб выратоўваць? Вось, пагрозай Маёй Я высушваю
мора, перамяняю рэкі ў пустыню, і гніюць рыбы іхнія без вады, і дохнуць ад смагі.
3 Я апранаю ў цемру неба і зрэбніцу раблю пакрыцьцём ягоным».
4 Госпад ГОСПАД даў Мне язык вучня, каб Я ведаў, як падтрымаць зьняможанага словам
бадзёрым. Кожную раніцу Ён абуджае вуха Маё, каб Я слухаў Яго, як вучань.
5 Госпад ГОСПАД адкрыў Мне вуха, і Я не супрацівіўся, не адступіўся назад.

6 Сьпіну Маю Я падставіў тым, якія б'юць, і шчокі Мае — тым, якія ўдараюць. Аблічча Маё Я не
схаваў ад ганьбы і пляваньня.
7 Але Госпад ГОСПАД дапаможа Мне, таму Я не саромеюся, таму Я зрабіў аблічча Маё як
крэмень, і ведаю, што ня буду ў ганьбе.
8 Блізка Той, Які апраўдвае мяне. Хто будзе спрачацца са Мною? Станьма [насупраць] разам!
Хто абвінаваўца ў судзе Маім? Няхай падыйдзе да Мяне.
9 Вось, Госпад ГОСПАД дапаможа Мне. Хто будзе вінаваціць Мяне? Вось, усе яны спарахнеюць,
як адзеньне, і моль зьесьць іх.
10 Хто з вас баіцца ГОСПАДА, няхай слухае голас Слугі Ягонага! Хто ходзіць у цемры і няма
яму сьвятла, няхай спадзяецца на імя ГОСПАДА і няхай абапіраецца на Бога свайго.
11 Вось, вы ўсе, якія распальваеце агонь, узбройваецеся стрэламі вогненнымі, ідзіце ў полымя
агню вашага, сярод стрэлаў вогненных, якія вы распалілі. Гэта рука Мая зрабіла вам, і вы
будзеце качацца ў пакутах.

Іс 51

1 Слухайце Мяне вы, якія імкнецеся да праведнасьці, якія шукаеце ГОСПАДА. Паглядзіце на
скалу, з якой вы высечаныя, і на глыбіню ямы, з якой вы выцягнутыя.
2 Паглядзіце на Абрагама, бацьку вашага, і на Сару, якая нарадзіла вас, бо Я паклікаў яго аднаго
і дабраславіў яго, і памножыў яго.
3 Бо пацешыць ГОСПАД Сыён, пацешыць усе руіны ягоныя, і зробіць Ён пустыню ягоную
як Эдэм, і стэп ягоны — як сад ГОСПАДА. І будуць знойдзены ў ім вясёласьць і радасьць,
дзякаваньне і голас сьпяваньня.
4 Паслухай Мяне, народзе Мой, племя Маё, прыхілі вуха да Мяне, бо Закон выйдзе ад Мяне, і
суд Мой Я пастаўлю як сьвятло для народаў.
5 Блізка праведнасьць Мая, выходзіць збаўленьне Маё, і рамяно Маё будзе судзіць народы; на
Мяне чакаюць астравы і на рамяно Маё спадзяюцца.
6 Узьніміце да неба вочы свае і гляньце на зямлю ўнізе, бо неба, як дым счэзьне, і зямля як
адзеньне распадзецца, і жыхары ейныя як камары пагінуць, а збаўленьне Маё будзе вечным, і
праведнасьць Мая ня спыніцца.
7 Паслухайце Мяне вы, якія ведаеце праведнасьць, народ, у сэрцы якога Закон Мой. Ня бойцеся
ганьбаваньня ад людзей і не палохайцеся зьнявагаў іхніх.
8 Бо як адзеньне, зьесьць іх моль, і як воўну, зьесьць іх чарвяк, а праведнасьць Мая будзе
вечная, і збаўленьне Маё — з пакаленьня ў пакаленьне.
9 Абудзіся, абудзіся! Апраніся ў магутнасьць, рамяно ГОСПАДА! Прабудзіся, як у дні
старадаўнія, як у пакаленьнях [мінулых] вякоў. Ці ж ня Ты — Той, Які пасек Рагава, прабіў
цмока?
10 Ці ж ня Ты — Той, Які высушыў мора, ваду вялікага бяздоньня, глыбіні мора зрабіў шляхам,
каб ішлі адкупленыя?
11 Так вызваленыя ГОСПАДАМ вернуцца і прыйдуць на Сыён са сьпяваньем; і радасьць вечная
над галовамі іхнімі; і яны атрымаюць радасьць і вясёласьць, а смутак і ўздыханьне ўцякуць.
12 Я, Я — Той, Які пацяшае вас! Хто ты, што баішся чалавека, які памірае, і сына чалавечага, які
як трава [высыхае]?
13 І ты забываешся пра ГОСПАДА, Які зрабіў цябе, Які расьцягнуў неба і заснаваў зямлю, і ты
ўсьцяж, кожны дзень баішся гневу прыгнятальніка, які гатовы [цябе] загубіць. Але дзе той
гнеў прыгнятальніка?
14 Хутка палонны будзе вызвалены і не памрэ ў яме, і ня будзе бракаваць яму хлеба.
15 Бо Я — ГОСПАД, Бог твой, Які ўзбурвае мора, і ўздымаюцца хвалі ягоныя, ГОСПАД Магуцьцяў
— імя Ягонае.
16 І Я ўлажыў словы Мае ў вусны твае, і ў ценю рукі Маёй Я схаваў цябе, каб расьцягнуць неба
і заснаваць зямлю, і сказаць Сыёну: «Ты — народ Мой!»
17 Абудзіся, абудзіся, устань, Ерусалім, ты, які піў з рукі ГОСПАДА келіх гневу Ягонага, выпіў
фуз з келіху ап'яненьня, выпіў да дна.

18 Не было нікога, хто б падтрымаў яго. З усіх сыноў, якіх ён нарадзіў, і з усіх сыноў, якіх
выгадаваў, не было ніводнага, хто б падтрымаў руку ягоную.
19 Вось, дзьве [бяды] спаткалі цябе, але хто пашкадуе цябе? Спусташэньне і загуба, голад і меч,
і хто пацешыць цябе?
20 Сыны твае зьнясіленыя, ляжаць на скрыжаваньнях усіх вуліцаў як сарна ў цянётах, поўныя
гневу ГОСПАДА, пагрозаў Бога твайго.
21 Дзеля гэтага паслухай гэта, гаротны і ап'янелы, але не ад віна.
22 Гэта кажа Госпад твой, ГОСПАД, Бог твой, Які заступаецца за народ Свой: «Вось, Я забіраю з
рукі тваёй келіх ап'яненьня, фуз з келіху гневу Майго, і ты ня будзеш больш піць яго.
23 І Я дам яго ў рукі тых, якія прыгняталі цябе і казалі да душы тваёй: "Схіліся, каб мы прайшлі
[па табе]!" І ты лажыў сьпіну тваю як зямлю і як вуліцу для тых, што праходзяць».

Іс 52

1 Абудзіся, абудзіся! Апрані моц тваю, Сыёне! Апрані шаты прыгажосьці тваёй, Ерусаліме,
горад сьвяты! Бо ня ўвойдзе больш да цябе неабрэзаны і нячысты.
2 Абтрасіся ад пылу, устань, і сядай, Ерусаліме! Разьвяжы путы на шыі тваёй, паланянка, дачка
Сыёну!
3 Бо гэта кажа ГОСПАД: «Задарма вы былі прададзеныя, і будзеце не за срэбра адкупленыя».
4 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: «Народ Мой перш зыйшоў у Эгіпет, каб жыць там, і Ашур без
прычыны прыгнятаў яго.
5 А цяпер што Мне тут [рабіць], кажа ГОСПАД, бо народ Мой забраны дарма? Тыя, што пануюць
над імі, хваляцца, кажа ГОСПАД, і ўсьцяж, кожны дзень імя Маё зьневажаюць.
6 Дзеля таго народ Мой даведаецца імя Маё ў гэты дзень, бо Я — Той, Які гаворыць: "Вось Я!"»
7 Якія прыгожыя на гарах ногі тых, што дабравесьцяць і абвяшчаюць мір, дабравесьцяць дабро
і абвяшчаюць збаўленьне, кажуць Сыёну: «Валадарыць Бог твой»!
8 Голас вартаўнікоў тваіх, яны ўзьнімаюць голас, разам сьпяваюць, бо на ўласныя вочы бачаць,
як ГОСПАД вяртаецца на Сыён.
9 Гаманіце радасна і сьпявайце разам, руіны Ерусаліму, бо пацешыў ГОСПАД народ Свой,
адкупіў Ерусалім!
10 Зьявіў ГОСПАД рамяно сьвятасьці Сваёй на вачах усіх народаў, і ўбачаць усе канцы зямлі
збаўленьне Бога нашага.
11 Ідзіце, ідзіце! Выходзьце адтуль! Не дакранайцеся нячыстага! Выходзьце з сярэдзіны яго!
Ачысьціцеся, вы, якія нясеце начыньні ГОСПАДА!
12 Бо вы выйдзеце, не сьпяшаючыся, і ня будзеце ісьці, быццам уцякаючы, бо пойдзе перад
абліччам вашым ГОСПАД, а за вамі будзе аховай Бог Ізраіля.
13 Вось, будзе мець посьпех Слуга Мой, Ён узьнімецца і ўзьвялічыцца, і будзе вельмі вялікі.
14 Як шмат [людзей] аслупянела, [гледзячы] на Яго, бо так нялюдзка быў зьнявечаны выгляд
Ягоны і постаць Ягоная [стала непадобная] на сына чалавечага.
15 Так шматлікія народы зьдзівяцца, і валадары закрыюць вусны свае перад Ім, бо ўбачаць тое,
пра што ім ніколі не расказвалі, і зразумеюць тое, пра што ня чулі.

Іс 53

1 Хто паверыў вестцы нашай? І каму аб'явілася рамяно ГОСПАДА?
2 Бо Ён вырас, быццам парастак перад абліччам Ягоным, і нібы корань з зямлі сухой. Не было
ў Ім ані прывабнасьці, ані прыгажосьці, і мы глядзелі на Яго, і не было выгляду ў Ім, каб нам
спадабаўся.
3 Ён быў пагарджаны і адкінуты людзьмі, муж пакутаў, які паспытаў хваробы, і перад Ім
закрывалі абліччы [свае]. Ён быў пагарджаны, і мы мелі Яго за нішто.
4 Але Ён узяў на Сябе немачы нашыя і панёс хваробы нашыя, а мы ўважалі Яго за асуджанага,
за пакаранага Богам і прыніжанага.

5 Але Ён быў прабіты за грахі нашыя, быў катаваны за беззаконьні нашыя; пакараньне [дзеля]
міру нашага [было] на Ім, і ранамі Ягонымі мы аздароўлены.
6 Усе мы як авечкі заблукалі, кожны з нас зьвярнуў на шлях свой, і ГОСПАД узлажыў на Яго
беззаконьне ўсіх нас.
7 Мучылі Яго, і зьдзекваліся з Яго, і Ён не адкрыў вуснаў Сваіх. Як ягня, ведзенае на зарэз, і як
авечка нямая перад абліччам тых, якія стрыгуць яе, так Ён не адкрыў вуснаў Сваіх.
8 Пасьля вязьніцы і суду Ён быў забраны, і пра паходжаньне Ягонае хто раскажа? Бо Ён быў
вырваны з зямлі жывых, за правіны народу Майго быў пакараны.
9 І дадзена Яму магіла сярод бязбожнікаў, але ў багатага пахавалі Яго, хоць [нікому] не зрабіў
Ён крыўды і не было падману ў вуснах Ягоных.
10 А ГОСПАД зажадаў скрышыць Яго і аддаць на пакуты. Калі Ён аддасьць душу Сваю ў ахвяру
за грэх, Ён убачыць насеньне [Сваё] і будзе мець доўгія дні, і жаданьне ГОСПАДА будзе рукою
Ягонай споўнена.
11 Пасьля пакутаў душы Сваёй Ён убачыць [сьвятло] і насыціцца. Праведны Слуга Мой праз
пазнаньне Сваё апраўдае многіх, і беззаконьні іхнія Ён панясе.
12 Дзеля гэтага Я дам Яму [частку] сярод многіх, і з магутнымі Ён будзе дзяліць здабычу за
тое, што Ён аддаў душу Сваю на сьмерць, і ў злачынцы быў залічаны. І Ён панёс на Сабе грахі
многіх, і заступіўся за злачынцаў.

Іс 54

1 Радуйся, няплодная, якая не нараджала, галасі радасна і весяліся ты, якая не спазнала родаў,
бо больш сыноў у кінутай, чым сыноў у замужняй, кажа ГОСПАД.
2 Пашыр месца намёту твайго, расьцягні пакрыцьці жытла твайго, ня стрымлівай сябе,
папусьці даўжэй вяроўкі твае, умацуй калкі твае.
3 Бо ты пашырышся направа і налева, і насеньне тваё возьме ў спадчыну народы і заселіць
гарады спустошаныя.
4 Ня бойся, бо не дазнаеш сораму, і не чырваней, бо ня будзеш у ганьбе, бо забудзешся пра
сорам маладосьці тваёй і ня будзеш больш памятаць пра ганьбу ўдаўства твайго.
5 Бо Той, Які ўзяў за жонку цябе — [гэта] Той, Які зрабіў цябе. ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае,
і Адкупіцель твой — Сьвяты Ізраіля, Яго называюць Богам усёй зямлі.
6 Бо, як жанчыну кінутую і засмучаную духам, паклікаў цябе ГОСПАД, і як да пакінутай жонкі
маладосьці кажа Бог твой.
7 На хвіліну малую Я пакінуў цябе, але з літасьцю вялікай прыму цябе.
8 У запале гневу Я схаваў на хвіліну аблічча Маё ад цябе, але ў міласэрнасьці вечнай
пашкадаваў цябе, кажа Адкупіцель твой, ГОСПАД.
9 Як воды Ноя гэта для Мяне. Калі Я прысягнуў яму, што ня прыйдуць больш воды Ноя на
зямлю, так прысягаю і табе, што ня буду гневацца на цябе і дакараць цябе.
10 Бо горы зрушацца і ўзгоркі захістаюцца, але міласэрнасьць Мая не адыйдзе ад цябе, і запавет
супакою Майго не пахісьнецца, кажа ГОСПАД, Які літуецца над табою.
11 Няшчасная, кіданая бурамі, без пацяшэньня! Вось, Я пакладу на малахіце камяні твае і
падмуркі твае — на шафірах.
12 І Я зраблю вокны твае з рубінаў, а брамы твае — з камянёў гранату, а ўсю агароджу тваю —
з камянёў каштоўных.
13 І ўсе сыны твае [стануць] вучнямі ГОСПАДА, і вялікі супакой [дам] сынам тваім.
14 І будзеш ты ўмацаваная ў праведнасьці, і будзеш далёкая ад уціску, бо ня будзеш баяцца, і
[далёкая] ад страху, бо ён не наблізіцца да цябе.
15 Калі прыйдзе навала на цябе, гэта [будзе] не ад Мяне, і той, хто на цябе нападзе, упадзе
перад табою.
16 Вось, Я стварыў каваля, які дзьме на жар агню і выцягвае з яго прылады для працы сваёй. І
Я стварыў нішчыцеля, каб пустошыць.

17 Усякая прылада, выраблена супраць цябе, ня будзе мець посьпеху, і кожны язык, які стане
супраць цябе ў судзе, ты асудзіш. Гэта — спадчына слугаў ГОСПАДА, і праведнасьць іхняя — ад
Мяне, кажа ГОСПАД.

Іс 55

1 Гэй, усе спрагнёныя, прыходзьце да вады, і тыя, што ня маюць срэбра, прыходзьце, купляйце
і спажывайце; прыходзьце і купляйце бяз срэбра і бяз платы віно і малако!
2 Навошта вы адважваеце срэбра за тое, што ня хлеб, і працу сваю за тое, што не насыціць?
Слухаючы, паслухайце Мяне і будзеце есьці [тое, што] добрае, і будзе насалоджвацца тлустым
душа вашая.
3 Прыхіліце вуха сваё і прыйдзіце да Мяне, паслухайце, і будзе жыць душа вашая! І Я заключу
з вамі запавет вечны дзеля нязьменнай міласэрнасьці, [абяцанай] Давіду.
4 Вось, Я паставіў яго сьведкам для народаў і правадыром, які дае загады людзям.
5 Вось, ты паклічаш народ, якога ня ведаеш, і народы, якія цябе ня ведалі, прыбягуць да цябе
дзеля ГОСПАДА, Бога твайго, і дзеля Сьвятога Ізраіля, бо Ён уславіў цябе.
6 Шукайце ГОСПАДА, пакуль можна знайсьці Яго, клічце Яго, пакуль Ён блізка!
7 Няхай бязбожнік пакіне шлях свой, а нягоднік — намеры свае, і няхай вернецца да ГОСПАДА,
і Ён зьлітуецца над ім, і да Бога нашага, бо Ён шчодры на прабачэньне.
8 Бо думкі Мае — гэта ня думкі вашыя, і шляхі вашыя — гэта не шляхі Мае, кажа ГОСПАД.
9 Бо як неба высока над зямлёю, так вышэйшыя шляхі Мае ад шляхоў вашых, і думкі Мае — ад
думак вашых.
10 Бо як дождж або сьнег зыходзіць з неба і назад не вяртаецца, аж пакуль не напоіць зямлю і
ня зробіць, каб яна радзіла і давала зеляніну, і давала насеньне таму, хто сее, і хлеб таму, хто
есьць,
11 так і слова Маё, якое выходзіць з вуснаў Маіх. Яно не вяртаецца да Мяне пустым, але
зьдзяйсьняе тое, што Я жадаю, і мае посьпех у тым, дзеля чаго Я паслаў яго.
12 Бо вы з радасьцю выйдзеце, і ў супакоі правядуць вас. Горы і ўзгоркі перад вамі будуць
цешыцца са сьпяваньнем, а ўсе дрэвы палявыя будуць пляскаць у далоні.
13 Замест церняў вырасьце кіпарыс, замест крапівы вырасьце мірт, і будзе гэта на хвалу
ГОСПАДУ, як знак вечны, які ня будзе зьнішчаны.

Іс 56

1 Гэта кажа ГОСПАД: «Захоўвайце суд і чыніце праведнасьць, бо неўзабаве прыйдзе збаўленьне
Маё, і праведнасьць Мая аб'явіцца».
2 Шчаслівы чалавек, які так робіць, і сын чалавечы, які трымаецца гэтага, які захоўвае суботу,
каб не паганіць яе, і захоўвае руку сваю, каб не рабіць ніякага зла.
3 Няхай ня кажа сын чужынца, які далучыўся да ГОСПАДА, кажучы: «Адлучаючы, адлучыць
мяне ГОСПАД ад народу Свайго». Няхай ня кажа эўнух: «Вось, я — дрэва сухое».
4 Бо гэта кажа ГОСПАД пра эўнухаў, якія захоўваюць суботы Мае і выбіраюць тое, што
падабаецца Мне, і трымаюцца моцна запавету Майго:
5 «Я дам ім у доме Маім і ў мурах Маіх памяць і імя лепшае, чым у сыноў і дачок, дам ім імя
вечнае, якое ня будзе зьнішчана».
6 А сыноў чужынцаў, якія далучыліся да ГОСПАДА, каб служыць Яму і любіць імя ГОСПАДА,
і быць для Яго слугамі, усіх, хто захоўвае суботу, каб не паганіць яе, і хто трымаецца моцна
запавету Майго,
7 Я завяду на гару сьвятасьці Маёй і ўзрадую іх у доме малітвы Маім. Цэласпаленьні іхнія і
ахвяры іхнія будуць даспадобы [Мне] на ахвярніку Маім, бо дом Мой будзе названы домам
малітвы для ўсіх народаў.
8 Кажа Госпад ГОСПАД, Які зьбірае выгнанцаў Ізраіля: «Яшчэ Я зьбяру [іншых] да яго, акрамя
тых, якія ўжо сабраныя».
9 Усе зьвяры палявыя, прыходзьце, і ешце, усе зьвяры лясныя.

10 Вартаўнікі іхнія ўсе сьляпыя, нічога ня ведаюць. Усе яны — сабакі нямыя, якія ня могуць
брахаць, дрэмлюць, вылежваюцца, любяць спаць.
11 І гэта сабакі ненажэрныя, якія ня ведаюць сытасьці! Гэта пастыры, якія ня маюць
разуменьня, усе яны завярнулі на шлях свой, кожны [шукае] карысьці сваёй і ня маюць канца
[ў гэтым],
12 [кажучы]: «Прыходзьце, я вазьму віна, і нап'емся сікеры, і заўтра будзе як сёньня, хіба нават
лепш».

Іс 57

1 Праведны гіне, і няма чалавека, які бярэ [гэта] да сэрца; людзі міласэрныя забіраюцца, і няма
[нікога], хто б зразумеў, што ад аблічча зла забіраецца праведнік.
2 Ён адыходзіць у супакоі; супачываюць на ложках сваіх тыя, якія ходзяць [шляхам] простым.
3 Наблізьцеся сюды вы, сыны вядзьмаркі, насеньне чужаложніцы і распусьніцы.
4 З каго вы зьдзекуецеся? На каго раскрываеце рот і высоўваеце язык? Ці ж вы ня дзеці бунту,
насеньне хлусьні?
5 Вы распаляецеся [юрлівасьцю] да ідалаў пад кожным дрэвам зялёным, забіваеце [ў ахвяру]
дзяцей у ярах і ў шчылінах скалаў.
6 Гладкія [камяні] ў ярах — частка твая, яны, яны — жэрабя тваё. Для іх ты вылівала ахвяру
вадкую, складала ахвяру хлебную. Ці ж гэтым Я маю быць усьцешаны?
7 На гары вялікай і высокай ты паставіла ложак свой, і туды ўзыйшла, каб ахвяроўваць ахвяры.
8 І за дзьвярыма і за вушакамі [дзьвярэй] ты паставіла памятку тваю, бо ты [далёка] ад Мяне,
і распраналася, і ўзыходзіла, і пашырала ложак свой, і заключыла дамову з тымі, з кім любіш
ляжаць, дзе месца нагледзіш.
9 І пайшла ты да валадара з алеем, і павялічыла масьці свае, і паслала далёка пасланцоў сваіх,
і зыходзіла аж да адхлані.
10 Ты змучылася на шматлікіх шляхах тваіх, [але] не сказала: «Надарма!», і ты знаходзіла
бадзёрасьць для рукі тваёй, таму не саслабела.
11 Каго ж ты спалохалася і збаялася, што падманвала і ня ўзгадвала пра Мяне, і не зьмясьціла
[Мяне] ў сэрцы тваім? Ці ж не таму, што Я доўгі час маўчаў, ты не баішся Мяне?
12 Я выяўлю праведнасьць тваю і ўчынкі твае, і яны ня будуць на карысьць табе.
13 Калі будзеш клікаць, не абароніць цябе зграмаджэньне [ідалаў] тваіх, але ўсіх іх разьвее
вецер і падхопіць бура. А хто спадзяецца на Мяне, возьме ў спадчыну зямлю і паселіцца на
гары Маёй сьвятой.
14 І скажуць: «Прастуйце, прастуйце [дарогу], рыхтуйце шлях, прыбярыце перашкоды са
шляху народу Майго».
15 Бо гэта кажа Высокі і Узьнесены, Які жыве вечна, і Сьвятое імя Ягонае: «Я жыву на вышынях
і ў сьвятасьці, і [Я жыву] з тым, хто зламаны і спакораны духам, каб ажывіць дух пакорных і
ажывіць сэрца прыгнечаных.
16 Бо Я ня буду вечна спрачацца і ня буду заўсёды гневацца, бо тады [ўсякі] дух зьнікне перад
абліччам Маім і [ўсякае] дыханьне, якое Я зрабіў.
17 Я загневаўся і ўдарыў яго за беззаконьне хцівасьці ягонай, адвярнуўся і загневаўся; але ён,
узбунтаваны, пайшоў па шляху сэрца свайго.
18 Я бачыў шляхі ягоныя, і Я аздараўлю яго, і павяду яго, і дам пацяшэньне яму і тым, якія
сумуюць дзеля яго.
19 І Я ствару плод вуснаў. Супакой, супакой далёкім і блізкім, кажа ГОСПАД. І Я аздараўлю
яго».
20 А бязбожнік — як мора ўзбуранае, якое ня можа супакоіцца, і воды ягоныя выкідаюць балота
і бруд.
21 Няма супакою для бязбожных, кажа Бог мой.

Іс 58

1 Крычы на [ўсё] горла, ня стрымлівайся! Як труба, узьнімі голас твой і абвяшчай народу
Майму злачынствы іхнія, а дому Якуба — грахі іхнія.
2 Яны шукаюць Мяне з дня ў дзень і жадаюць ведаць шляхі Мае, быццам народ, які чыніць
праведнасьць і не занядбоўвае суду Бога свайго. Пытаюцца Мяне пра суд праведны, наблізіцца
да Бога жадаюць.
3 «Чаму мы посьцілі, а Ты ня бачыў? Мы мучылі душы нашыя, а Ты ня ведаеш?» Вось, у дзень
посту вашага вы спаўняеце пажаданьні вашыя і ўсіх работнікаў сваіх вы прыгнятаеце.
4 Вось, вы посьціце, каб вадзіцца і сварыцца, і б'іцёся кулакамі нахабна. Ня трэба посьціць так,
як у гэты дзень, каб быў выслуханы на вышынях голас ваш.
5 Ці ж гэта той пост, які Я выбраў, дзень, калі чалавек прыгнятае душу сваю, гне галаву сваю,
як трысьціна, і ў зрэбніцу апранаецца, і попелам пасыпае [галаву]? Ці ж гэта ты называеш
постам і днём, які ўпадабаў ГОСПАД?
6 Ці ж ня гэта пост, які Я выбраў: здымі кайданы бязбожнасьці, разьвяжы путы ярма, пусьці
ўцісканых на свабоду і ўсякае ярмо скрышы.
7 Ці ж ня ў тым [пост], каб падзяліцца хлебам сваім з галодным, убогіх і бяздомных увесьці ў
дом? Калі ўбачыш голага, апрані яго, і перад крэўным сваім не хавайся.
8 Тады зазіхціць сьвятло тваё, як зараніца, і рана твая хутка загоіцца, і пойдзе перад абліччам
тваім праведнасьць твая, а слава ГОСПАДА будзе ісьці за табой.
9 Тады будзеш клікаць, і ГОСПАД адкажа, будзеш крычаць, і Ён скажа: «Вось Я!» Калі ты
прыбярэш спаміж сябе ярмо і ня будзеш пагражаць пальцам і гаварыць ліхое,
10 і калі адкрыеш душу сваю галоднаму і душу засмучаную насыціш, тады заясьнее сьвятло
тваё ў цемры, і змрок твой [стане] як [сьвятло] апоўдні.
11 І будзе ГОСПАД весьці цябе заўсёды, і насыціць душу тваю ў зямлі сухой, і ўмацуе косткі
твае. І будзеш ты як сад паліваны, і як крыніца вады, у якой не сканчваецца вада ейная.
12 І адбудуюць [сыны] твае руіны адвечныя, ты адновіш падваліны многіх пакаленьняў, і
назавуць цябе аднавіцелем выломаў, абнавіцелем шляхоў для засяленьня.
13 Калі ты дзеля суботы стрымаеш нагу тваю, каб не рабіць справаў тваіх у дзень Мой сьвяты, і
назавеш суботу [днём] прыемным, сьвятым для ГОСПАДА і слаўным, і калі ўшануеш яе, каб
не ісьці шляхамі сваімі, і ня будзеш шукаць, каб [рабіць] справу тваю і прамаўляць словы
[пустыя],
14 тады ты будзеш насалоджвацца ГОСПАДАМ, і Ён падыме цябе на вышыні зямныя, і будзе
карміць цябе спадчынай Якуба, бацькі твайго, бо вусны ГОСПАДА прамовілі гэта.

Іс 59

1 Вось, рука ГОСПАДА не скарацілася, каб не магла дапамагчы, і вуха Ягонае ня стала цяжкім,
каб ня чуць.
2 Бо беззаконьні вашыя аддзялілі вас ад Бога вашага, і грахі вашыя схавалі аблічча Ягонае ад
вас, каб Ён [вас] ня чуў.
3 Бо далоні вашыя заплямленыя крывёю, а пальцы вашыя — беззаконьнем, вусны вашыя
прамаўляюць хлусьню, язык ваш мармыча ліхое.
4 Няма [нікога], хто кліча пра праведнасьць, няма [нікога], хто судзіць справядліва. Спа-
дзяюцца на пустое і гавораць марнае, зачынаюць гора і нараджаюць злачынства.
5 Выседжваюць яйкі гадзючыя і ткуць павуціньне; хто зьесьць яйкі іхнія, памірае, а з разьбітага
[яйка] вылазіць гадзіна.
6 Павуціньне іхняе не прыдасцца на адзеньне, і нельга апрануцца ў вырабы іхнія; учынкі іхнія
— учынкі злачынныя, і справа гвалту ў далонях іхніх.
7 Ногі іхнія бягуць да ліхоты і сьпяшаюцца, каб праліць кроў нявінную; думкі іхнія — думкі
злачынныя, спусташэньне і загуба на дарогах іхніх.
8 Ня ведаюць яны шляху супакою, няма суду на сьцежках іхніх, яны скрывілі шляхі свае;
кожны, хто ходзіць па іх, ня ведае супакою.

9 Дзеля гэтага суд аддаліўся ад нас, і не даходзіць да нас праведнасьць; чакаем сьвятла, а вось,
цемра, і [чакаем] яснасьці, а ходзім у змроку.
10 Як сьляпыя, мацаем сьцены, і як без вачэй, навобмацак ходзім, спатыкаемся апоўдні,
быццам у поцемках, поўныя сілаў, а быццам мёртвыя.
11 Усе мы рыкаем, быццам мядзьведзі, і як галубы стогнем. Чакаем суду, а яго няма, і
збаўленьня, але яно далёка ад нас.
12 Бо памножыліся правіны нашыя перад Табою, і грахі нашыя сьведчаць супраць нас; бо
правіны нашыя з намі, і беззаконьні нашыя мы ведаем.
13 Мы бунтуемся і хлусім супраць ГОСПАДА, і адступіліся ад Бога нашага; гаворым пра прыгнёт
і здраду, падманваем і нараджаем у сэрцы словы фальшывыя,
14 І адступіўся назад суд, і праведнасьць стаіць здалёк, спатыкнулася праўда на плошчы, і
справядлівасьць ня можа ўвайсьці.
15 І сталася, што праўда зьнікла, і той, хто ўцякае ад ліхоты, абрабаваны. І ўбачыў [гэта]
ГОСПАД, і ліхім [было] ў вачах Ягоных, што няма суду.
16 І бачыў Ён, што няма чалавека, і дзівіўся, што няма заступніка. І рамяно Ягонае дапамагло
Яму, і праведнасьць Ягоная падтрымала Яго.
17 Ён апрануў праведнасьць, як панцыр, і шалом збаўленьня на галаве Ягонай, Ён апрануў
шаты помсты, і руплівасьць, быццам плашч, накінуў.
18 Паводле ўчынкаў Ён адплоціць супраціўнікам Сваім гневам, ворагам Сваім — помстай, і
адплоціць помстай астравам.
19 І будуць баяцца імя ГОСПАДА на захадзе, і славы Ягонай — на ўсходзе сонца, бо Ён прыйдзе,
як рака бурлівая, якую вецер ГОСПАДА гоніць.
20 І прыйдзе Адкупіцель на Сыён і да [сыноў] Якуба, якія адвярнуліся ад злачынстваў [сваіх],
кажа ГОСПАД.
21 І вось запавет Мой з імі, кажа ГОСПАД: Дух Мой, які на табе, і словы Мае, якія Я ўклаў у вусны
твае, не адыйдуць ад вуснаў тваіх і ад вуснаў насеньня твайго, і ад вуснаў насеньня насеньня
твайго, кажа ГОСПАД, ад цяпер і на вякі.

Іс 60

1 Устань, сьвяціся, [Ерусалім], бо прыйшло сьвятло тваё, і слава ГОСПАДА заясьнела над табою.
2 Бо вось, цемра ахутае зямлю, і змрок — народы, а над табою заясьнее ГОСПАД, і слава Ягоная
зьявіцца над табою.
3 І прыйдуць народы да сьвятла твайго, і валадары — да зьзяньня бляску твайго.
4 Падымі вочы твае навакол і паглядзі, усе яны зьбіраюцца і ідуць да цябе. Сыны твае
прыходзяць здалёк, і дочак тваіх нясуць на плячах.
5 Тады ўбачыш і зазьзяеш, і затрапеча і пашырыцца сэрца тваё, бо зьвернецца да цябе багацьце
мора, і багацьце народаў прыйдзе да цябе.
6 Мноства вярблюдаў пакрые цябе, драмадэры з Мадыяну і з Эфы, усе яны з Шэвы прыйдуць,
яны нясуць золата і кадзіла, хвалу ГОСПАДУ абвяшчаюць.
7 Усе авечкі Кедару зьбяруцца да цябе, бараны Нэбаёту паслужаць табе, яны ўзыйдуць на
ахвярнік Мой як [ахвяра] ўпадабаная, і Я ўслаўлю дом красы Маёй.
8 Хто гэта, што лятуць як аблокі, як галубы да галубятняў сваіх?
9 Бо на Мяне чакаюць астравы, і першымі [плывуць] караблі Таршышу, каб прывезьці сыноў
тваіх здалёк, срэбра іхняе і золата іхняе з імі дзеля імя ГОСПАДА, Бога твайго, і дзеля Сьвятога
Ізраіля, бо Ён уславіў цябе.
10 Сыны чужынцаў адбудуюць муры твае, а валадары іхнія будуць служыць табе, бо ў гневе
Маім Я ўдарыў цябе, але ў ласкавасьці Маёй зьлітуюся над табою.
11 Брамы твае будуць адчыненыя заўсёды, удзень і ўначы ня будуць замыкацца, каб прыносілі
да цябе багацьці народаў і валадароў іхніх прыводзілі [да цябе].
12 Бо народ і валадарства, якія не захочуць служыць табе, прападуць, і народы будуць цалкам
выгублены.

13 Слава Лібану прыйдзе да цябе, [з ёй] разам кіпарысы, вязы і букі, каб упрыгожыць месца
Маё сьвятое, і Я праслаўлю месца, дзе [стаяць] ногі Мае.
14 І прыйдуць да цябе з паклонам сыны крыўдзіцеляў тваіх, і ўпадуць да стопаў ног тваіх усе,
якія пагарджалі табою, і назавуць цябе Горадам ГОСПАДА і Сыёнам Сьвятога Ізраіля.
15 За тое, што ты быў пакінуты і зьненавіджаны, і ніхто не хадзіў [праз цябе], Я зраблю цябе
славай вечнай, радасьцю з пакаленьня ў пакаленьне.
16 І будзеш ты смактаць малако народаў, і грудзі валадароў будзеш смактаць, і даведаешся,
што Я — ГОСПАД, Збаўца твой і Адкупіцель твой, Моцны Якуба.
17 Замест медзі Я прынясу золата, і замест жалеза прынясу срэбра, замест дрэва — медзь, і
замест камянёў — жалеза. І Я пастаўлю мір вартаўніком тваім, а праведнасьць — начальнікам
тваім.
18 Ня будзе больш чуваць у зямлі тваёй пра гвалт, пра спусташэньне і зьнішчэньне ў межах
тваіх. І ты назавеш муры твае збаўленьнем, а брамы твае — хвалою.
19 Ня будзе ўжо сонца сьвяціць табе днём, і бляск месяца ня будзе асьвятляць цябе, але ГОСПАД
будзе для цябе сьвятлом вечным, і Бог твой — аздобай тваёй.
20 Ня будзе больш заходзіць сонца тваё, і месяц твой не схаваецца, бо ГОСПАД будзе для цябе
сьвятлом вечным, і скончацца дні жалобы тваёй.
21 І ўвесь народ твой будзе праведным, яны возьмуць зямлю ў спадчыну на вякі. Яны —
парасткі насаджэньня Майго, твор рукі Маёй, каб Я праславіўся.
22 З найменшага станецца тысяча, а са слабога — народ магутны. Я, ГОСПАД, пасьпяшаюся
[зрабіць] гэта ў свой час.

Іс 61

1 Дух Госпада ГОСПАДА нада мною, бо ГОСПАД памазаў мяне дабравесьціць убогім, паслаў
мяне перавязаць раны зламаных сэрцам, абвяшчаць палонным вызваленьне, а вязьням —
свабоду,
2 абвяшчаць год ласкі ГОСПАДА і дзень помсты Бога нашага, пацешыць усіх засмучаных,
3 разьвесяліць тых, якія плачуць на Сыёне, і даць ім дыядэму замест попелу, і алей радасьці
замест смутку, адзеньне хвалы замест духу панурага, і назавуць іх дубамі праведнасьці,
насаджэньнем ГОСПАДА для праслаўленьня Яго.
4 І яны забудуюць руіны адвечныя, і адбудуюць спусташэньні старадаўнія, адновяць гарады
зруйнаваныя, спустошаныя з пакаленьня ў пакаленьне.
5 І стануць чужынцы, і будуць пасьвіць авечак вашых, і сыны чужынцаў будуць аратымі
вашымі і вінаградарамі вашымі.
6 А вы будзеце называцца сьвятарамі ГОСПАДА, і будуць вас называць слугамі Бога нашага. Вы
будзеце спажываць багацьці народаў і будзеце аздобленыя славай іхняй.
7 За падвойнае прыніжэньне [народу Майго], за ганьбу і зьнявагу, якія [былі] доляю іхняй, у
зямлі сваёй яны атрымаюць спадчыну падвойную; і радасьць вечная будзе для іх.
8 Бо Я, ГОСПАД, люблю суд і ненавіджу рабунак і крыўду; і Я дам ім нагароду паводле праўды,
і запавет вечны заключу з імі.
9 Насеньне іхняе будзе вядомым сярод народаў, і нашчадкі іхнія — сярод плямёнаў. Усе, хто
іх убачаць, пазнаюць, што яны — насеньне, дабраслаўлёнае ГОСПАДАМ.
10 Я цешуся ў ГОСПАДЗЕ, душа мая радуецца ў Богу маім, бо Ён апрануў мяне ў шаты
збаўленьня і накінуў на мяне плашч праведнасьці, як на жаніха, усклаў дыядэму, і як нявесту,
аздобіў упрыгожваньнямі.
11 Бо як зямля выдае зеляніну сваю, і як сад родзіць насеньне сваё, так Госпад ГОСПАД зробіць,
што вырасьце праведнасьць і хвала перад усімі народамі.

Іс 62

1 Дзеля Сыёну ня буду маўчаць, і дзеля Ерусаліму не супачыну, пакуль ня ўзыйдзе, як бляск
[зараніцы], праведнасьць ягоная, і збаўленьне ягонае — як паходня, што палае.

2 І ўбачаць народы праведнасьць тваю, і ўсе валадары — славу тваю, і назавуць цябе імем
новым, якое вызначаць вусны ГОСПАДА.
3 І ты станеш каронай славы ў руцэ ГОСПАДА і дыядэмай валадарства ў далоні Бога твайго.
4 І ня будуць больш казаць пра цябе “пакінутая”, і пра зямлю тваю ня будуць больш казаць
“спустошаная”, бо назавуць цябе “Маё ўпадабаньне ў ёй”, а зямлю тваю — “замужняя”, бо
ўпадабаў цябе ГОСПАД, і зямля твая будзе замужам.
5 Бо як юнак жэніцца з дзяўчынаю, так Будаўнік твой ажэніцца з табою, і як жаніх цешыцца з
нявесты, так будзе цешыцца з цябе Бог твой.
6 На мурах тваіх, Ерусалім, Я паставіў вартаўнікоў, увесь дзень і ўсю ноч яны ніколі ня будуць
маўчаць. Вы, якія нагадваеце пра ГОСПАДА, ня мейце супакою,
7 і Яму не давайце супакою, пакуль Ён не адновіць Ерусалім і пакуль ня зробіць яго хвалою на
зямлі.
8 Прысягнуў ГОСПАД правіцай Сваёй і рамяном моцы Сваёй: «Ня дам больш збожжа твайго
ворагам тваім, і ня будуць піць сыны чужынцаў маладога віна твайго, над якім ты працаваў.
9 Бо тыя, якія зьбіраюць [збожжа], будуць есьці яго і будуць хваліць ГОСПАДА, і тыя, якія
зьбіраюць [вінаград], будуць піць яго на панадворку сьвятыні Маёй».
10 Праходзьце, праходзьце праз браму! Рыхтуйце шлях народу! Прастуйце, прастуйце
гасьцінец, прыбярыце камяні! Падыміце сьцяг для народаў!
11 Вось, ГОСПАД абвяшчае аж да краю зямлі: «Скажыце дачцы Сыёну: “Вось, прыходзіць Збаўца
твой, вось, плата Ягоная разам з Ім і нагарода Ягоная перад абліччам Ягоным”».
12 І будуць называць іх народам сьвятым, адкупленымі ГОСПАДАМ, а цябе будуць клікаць
“Пажаданая”, “Горад непакінуты”.

Іс 63

1 Хто гэта ідзе з Эдому, у шатах барвовых з Боцры? Хто такі прыгожы ў строях Сваіх крочыць
з вялікай сілай Сваёй? «[Гэта] Я, Які прамаўляе ў праведнасьці, вялікі ў збаўленьні».
2 Чаму чырвонае адзеньне Тваё, і шаты Твае — як у таго, які топча [вінаград] у тоўчні?
3 «Я Сам таптаў у тоўчні і не было з народаў нікога са Мною. Я таптаў іх у гневе Маім, таптаў
іх у абурэньні Маім. Сок апырскаў шаты Мае, і паплямі́ў Мне ўсё адзеньне Маё.
4 Бо дзень помсты — у сэрцы Маім, і год адкупленьня Майго надыйшоў.
5 І Я глядзеў, і не было таго, хто дапамагае, і зьдзівіўся, бо не было таго, хто падтрымаў Мяне.
І дапамагло Мне рамяно Маё, і гнеў Мой падтрымаў Мяне.
6 І Я стаптаў народы ў гневе Маім, і сьцёр іх у абурэньні Маім, і выліў кроў іхнюю на зямлю».
7 Буду ўзгадваць міласэрнасьць ГОСПАДА, праслаўляць ГОСПАДА за ўсё, што ГОСПАД для нас
учыніў, і за мноства дабрадзействаў для дому Ізраіля, якія Ён учыніў для нас у ласкавасьці
Сваёй і паводле вялікай ласкі Сваёй.
8 І Ён сказаў: «Яны, сапраўды, — народ Мой, сыны, якія не падманваюць!» І Ён стаў для іх
Збаўцам.
9 У кожным уціску іхнім цесна [было] і Яму, і анёл аблічча Ягонага выбаўляў іх. У любові Сваёй
і ў ласкавасьці Сваёй Ён Сам адкупіў іх, і ўзяў іх, і насіў іх усе дні старадаўнія.
10 Але яны сталіся непаслухмянымі і засмуцілі Духа Сьвятога Ягонага, і стаўся Ён для іх
ворагам, і пачаў ваяваць з імі.
11 І ўзгадаў народ Ягоны дні старадаўнія, дні Майсея. Дзе Той, Які вывеў іх з мора з пастырам
авечак Сваіх? Дзе Той, Які зьмясьціў у нутро іхняе Духа Свайго Сьвятога?
12 [Дзе] Той, Які вёў Майсея за правую руку рамяном велічы Сваёй, Які разьдзяліў воды перад
абліччам іхнім, каб зрабіць Сабе імя вечнае,
13 Які вёў іх праз бяздоньні, як каня ў пустыні, і яны не спатыкаліся?
14 Як жывёлу, якая зыходзіць у лагчыну, так Дух ГОСПАДА вёў іх да супачынку. Так вёў Ты
народ Твой, каб зрабіць Сабе імя велічнае.
15 Глянь з неба і пабач з Сялібы сьвятасьці Тваёй і велічы Тваёй! Дзе рэўнасьць Твая і
магутнасьць Твая? Узрушанасьці нутра Твайго і ласкавасьці Тваёй да мяне ня стрымлівай.

16 Бо Ты — Айцец наш! Бо Абрагам ня ведае нас, і Ізраіль не пазнае нас. Ты, ГОСПАДЗЕ, — Айцец
наш, Адкупіцель наш — гэта імя Тваё адвечна.
17 Дзеля чаго, ГОСПАДЗЕ, Ты дазволіў нам збочыць са шляхоў Тваіх, зрабіў цьвёрдым сэрца
нашае, каб мы не баяліся Цябе? Вярніся дзеля слугаў Тваіх, дзеля племені спадчыны Тваёй.
18 На кароткі час завалодалі прыгнятальнікі нашыя народам сьвятасьці Тваёй, патапталі
сьвятыню Тваю.
19 Мы сталіся як тыя, над якімі Ты ад вякоў не панаваў, і [як тыя], над якімі ня клікалі імя Тваё.

Іс 64

1 О, каб Ты разьдзёр неба і зыйшоў! Перад абліччам Тваім растапіліся б горы!
2 Як агонь паліць гальлё, і як кіпіць вада на агні, так дай пазнаць імя Тваё ворагам Тваім. Перад
абліччам Тваім будуць дрыжаць народы.
3 Калі Ты чыніш страшныя рэчы, якіх мы не чакалі, Ты зыходзіш, і перад абліччам Тваім
топяцца горы!
4 Ад вякоў не было чуваць, і да вуха не даходзіла, і вока ня бачыла Бога, акрамя Цябе, Які б
зрабіў [гэта] тым, якія Яго чакаюць.
5 Ты выходзіш насустрач таму, хто з радасьцю чыніць праведнасьць, [насустрач] тым, якія на
шляхах Тваіх памятаюць пра Цябе. Вось, Ты загневаўся, бо мы грашылі здаўна. І як [нам] быць
збаўленымі?
6 І ўсе мы сталіся як нячысты, і ўся праведнасьць наша як заплямленая [месячнымі] адзежа, і
мы ўсе вянем, як лісьце, і беззаконьні нашыя панесьлі нас як вецер.
7 І няма нікога, хто клікаў бы імя Тваё, хто б абудзіўся, каб трымацца моцна Цябе, бо Ты
адвярнуў аблічча Тваё ад нас і аддаў нас у рукі беззаконьняў нашых.
8 І цяпер Ты, ГОСПАДЗЕ — Айцец наш, а мы — гліна; Ты — Той, Які лепіш нас, а мы ўсе — творы
рук Тваіх!
9 Ня гневайся, ГОСПАДЗЕ, так моцна і ня памятай заўсёды беззаконьне [нашае]. Вось, паглядзі,
мы ўсе — народ Твой!
10 Гарады сьвятыя Твае сталіся пустыняй, Сыён стаўся пустыняй, і Ерусалім стаўся пусткаю.
11 Дом сьвятасьці нашай і велічы нашай, у якім славілі Цябе бацькі нашыя, спалены агнём, і
ўсё, што мы любілі, сталася руінай.
12 Ці ж на ўсё гэта Ты можаш быць абыякавы, ГОСПАДЗЕ? [Ці] Ты будзеш маўчаць і караць нас
так моцна?

Іс 65

1 Я адкрыўся тым, якія не пыталіся пра Мяне, Я знойдзены тымі, якія не шукалі Мяне. Я казаў:
«Вось Я, вось Я!» да народу, які ня клікаў імя Маё.
2 Увесь дзень Я выцягваў рукі Мае да народу бунтаўнічага, які ходзіць па шляху нядобрым,
паводле намераў сваіх,
3 да народу, які гнявіць Мяне перад абліччам Маім заўсёды, які складае ахвяры ў гаях і паліць
кадзіла на цэглах.
4 Яны сядзяць у магілах, начуюць у заканурках, ядуць сьвіное мяса, і стравы нячыстыя ў
пасудзінах іхніх,
5 яны кажуць: «Адыйдзіся! Не набліжайся да мяне, бо я — сьвяты для цябе». Яны [выклікаюць]
дым у ноздрах Маіх, агонь, які палае ўвесь дзень.
6 Вось, напісана перад абліччам Маім. Ня буду маўчаць, пакуль не аднагароджу, і не
аднагароджу ва ўлоньне іхняе.
7 За беззаконьні вашыя і за беззаконьні бацькоў вашых, кажа ГОСПАД, што вы кадзілі на гарах
і на ўзгорках зьневажалі Мяне, Я адмераю ім плату ва ўлоньне іхняе за ўчынкі старадаўнія.
8 Гэта кажа ГОСПАД: «Калі знаходзіцца сок у гронках вінаградных і кажуць: “Ня нішчыце іх,
бо ў іх дабраславенства”, так і Я зраблю дзеля слугаў Маіх, каб ня нішчыць усяго.
9 І Я выведу з Якуба насеньне, а з Юды — спадкаемца гор Маіх, і выбранцы Мае ўспадкаемяць
[зямлю], і слугі Мае будуць жыць там.

10 І стане Шарон пашаю для авечак, а даліна Ахор — выганам для быдла для народу Майго, які
шукае Мяне.
11 А вы пакінулі ГОСПАДА і забыліся пра сьвятую гару Маю, і накрываеце стол у гонар Гада і
напаўняеце [келіхі] віном мяшаным у гонар Мэні.
12 І Я прызначаю [вас] пад меч, і ўсе вы пойдзеце на зарэз, бо Я клікаў вас, а вы не адказвалі,
гаварыў, а вы ня слухалі, і чынілі ліхоту на вачах Маіх, і выбралі сабе тое, што Мне не
падабалася».
13 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: «Вось, слугі Мае будуць есьці, а вы будзеце галадаць;
слугі Мае будуць піць, а вы будзеце смагнуць; слугі Мае будуць радавацца, а вы будзеце
асаромленыя.
14 Вось, слугі Мае будуць сьпяваць з радасьцю сэрца, а вы будзеце крычаць з болем сэрца,
будзеце галасіць з прыгнечаным духам.
15 І вы пакінеце імя вашае выбранцам Маім на праклён, [які кажа]: “Няхай заб’е цябе Госпад
ГОСПАД”, а слугі Мае будуць названыя іншым імем,
16 якім хто будзе дабраслаўляць на зямлі, будзе дабраслаўлёны Богам верным, а хто будзе
прысягаць на зямлі, будзе прысягаць Богам верным, бо ўціскі даўнейшыя забудуцца і будуць
закрытыя перад вачыма Маімі».
17 Бо вось, Я ствару новае неба і новую зямлю, і ня будуць узгадваць даўнейшае, і яно ня
прыйдзе на сэрца.
18 А вы будзеце цешыцца і весяліцца вечна з таго, што Я ствару, бо вось, Я ствару Ерусалім
дзеля вясёласьці, а народ ягоны — дзеля ўцехі.
19 І Я буду радавацца з Ерусаліму, і буду цешыцца з народу Майго, і ня будзе больш чуваць у
ім голас плачу і голас нараканьня.
20 І ня будзе з таго часу ў ім малога днямі і старога, які б не дапоўніў дзён сваіх, бо юнак памрэ
стогадовым, а стогадовы грэшнік будзе праклятьі.
21 І пабудуюць дамы, і будуць жыць [у іх], і пасадзяць вінаграднікі, і будуць есьці плады іхнія.
22 Ня будуць будаваць, каб хто іншы [ў іх] жыў, і ня будуць садзіць, каб хто іншы еў. Бо як
дні дрэва [будуць] дні народу Майго, і выбранцы Мае будуць карыстацца зробленым рукамі
іхнімі.
23 Ня будуць працаваць надарма, і ня будуць нараджаць [дзяцей] на загубу, бо яны — насеньне,
дабраслаўлёнае ГОСПАДАМ, і нашчадкі іхнія разам з імі.
24 І станецца, што перш, чым яны паклічуць, Я адкажу ім, і калі яшчэ будуць гаварыць, Я ўжо
выслухаю [іх].
25 Воўк і ягня будуць пасьвіцца разам, і леў, як вол, будзе есьці салому, а зьмей будзе жывіцца
парахном [зямлі]. І ня будуць чыніць зла, і ня будуць чыніць загубы на ўсёй гары Маёй
сьвятой, кажа ГОСПАД.

Іс 66

1 Гэта кажа ГОСПАД: «Неба — пасад Мой, а зямля — падножжа ног Маіх. Які [павінен быць]
дом, што вы пабудуеце Мне, і якое месца супачынку Майго?»
2 Усё гэта зрабіла рука Мая, і ўсё гэта Маё, кажа ГОСПАД. Але Я гляджу на таго, хто бедны і
прыгнечаны духам і хто трымціць перад словам Маім.
3 [Ёсьць такі,] што забівае ў ахвяру вала і забівае чалавека; ахвяроўвае барана і скручвае галаву
сабаку, складае ахвяру хлебную і ўжывае кроў сьвіньні, паліць кадзіла і шануе ідала. Як яны
выбралі шляхі свае, і душа іхняя ўпадабала брыдоту,
4 Я таксама выберу ім долю ліхую, і тое, чаго яны баяцца, навяду на іх, бо Я клікаў, і ніхто
не адказваў, гаварыў, а яны ня слухалі, і чынілі ліхоту на вачах Маіх, і тое выбіралі, што не
падабалася Мне.
5 Слухайце слова ГОСПАДА вы, якія трымціце перад словам Ягоным. Кажуць браты вашыя,
якія ненавідзяць вас, якія выганяюць вас з прычыны імя Майго: «Няхай ГОСПАД зьявіць славу
Сваю, каб мы ўбачылі радасьць вашую», але яны будуць асаромленыя.

6 Голас гоману з гораду, голас са Сьвятыні, [гэта] голас ГОСПАДА, Які дае адплату ворагам
Сваім.
7 Перш, чым адчула боль радзінаў, нарадзіла [дзіця], перш, чым прыйшлі роды, нарадзіла
хлопца.
8 Хто калі чуў пра такое? Хто бачыў падобнае? Ці нараджаецца зямля ў адзін дзень? Ці
нараджаецца народ адным разам? Бо Сыён ледзь адчуў боль радзінаў і ўжо нарадзіў сыноў
сваіх!
9 Ці Я давяду да ўлоньня і ня дам нарадзіць, кажа ГОСПАД? Ці Я, даючы моц нарадзіць, зачыню
[ўлоньне], кажа Бог твой.
10 Радуйцеся з Ерусалімам, весяліцеся ў ім усе, якія любіце яго. Цешцеся з ім радасьцю ўсе,
якія смуткавалі дзеля яго,
11 каб вы смакталі і насыціліся з грудзей пацяшэньня ягонага, каб вы смакталі і
насалоджваліся з грудзей славы ягонай.
12 Бо гэта кажа ГОСПАД: «Вось, Я накірую да яго мір, як раку, і славу народаў — як павадкавы
ручай. На руках будуць насіць вас і на каленях будуць песьціць.
13 Як маці суцяшае [дзіця], так Я суцешу вас, і ў Ерусаліме вы будзеце суцешаныя».
14 І ўбачыце, і будзе радавацца сэрца вашае, і косткі вашыя расквітнеюць, як мурог, і рука
ГОСПАДА выявіцца слугам Ягоным, а гнеў Ягоны — ворагам Ягоным.
15 Бо вось ГОСПАД прыйдзе ў агні, і калясьніца Ягоная — быццам віхура, каб выліць жар гневу
Свайго і пагрозы Свае як полымя агню.
16 Бо агнём і мячом Сваім ГОСПАД будзе судзіць усякае цела, і шмат будзе пабітых ГОСПАДАМ.
17 А тыя, якія асьвячаюць сябе і ачышчаюць у гаях, [ідучы] адзін за адным у сярэдзіну [іх], і
ядуць мяса сьвіньні, і брыдоту, і мышэй, яны разам будуць зьнішчаны, кажа ГОСПАД.
18 Я [ведаю] ўчынкі іхнія і думкі іхнія, і прыйду, каб сабраць усе народы і мовы; і прыйдуць
яны, і ўбачаць славу Маю.
19 І Я пастаўлю ім знак, і пашлю выратаваных спаміж іх да народаў, у Таршыш, Пул, Люд,
Мэшэх, Кешэт, Туваль і Яван, на астравы далёкія, якія ня чулі весткі пра Мяне і ня бачылі славы
Маёй. І яны абвесьцяць славу Маю паміж народамі.
20 І яны прывядуць усіх братоў вашых з усіх народаў як дар для ГОСПАДА на конях і на вазах,
на насілах, і на мулах, і на вярблюдах на сьвятую гару Маю, у Ерусалім, кажа ГОСПАД, як сыны
Ізраіля прыносяць дар у чыстых пасудзінах у Дом ГОСПАДА.
21 І Я таксама вазьму з іх сьвятароў і лявітаў, кажа ГОСПАД.
22 Бо як новае неба і новая зямля, якія Я раблю, будуць стаяць перад абліччам Маім, кажа
ГОСПАД, так будзе стаяць насеньне вашае і імя вашае.
23 І станецца, што з маладзіка ў маладзік, з суботы ў суботу будзе прыходзіць кожнае цела, каб
пакланіцца перад абліччам Маім, кажа ГОСПАД.
24 І яны выйдуць, і ўбачаць трупы людзей, якія адступіліся ад Мяне, бо чарвяк іхні не памрэ, і
агонь іхні ня згасьне; і будуць яны брыдотай для ўсякага цела.

КНІГА ПРАРОКА ЯРЭМІІ

1 Словы Ярэміі, сына Хэлькіі, са сьвятароў, якія [былі] ў Анатоце ў зямлі Бэн'яміна.
2 Да яго было слова ГОСПАДА ў дні Ёсіі, сына Амона, валадара Юды, у трынаццатым годзе
валадараньня ягонага,
3 і ў дні Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, аж да канца адзінаццатага году Сэдэкіі, сына Ёсіі,
валадара Юды, аж да няволі Ерусаліму ў пятым месяцы.
4 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
5 «Перш, чым Я ўфармаваў цябе ва ўлоньні [маці], Я ведаў цябе; перш, чым ты выйшаў з чэрава,
Я пасьвяціў цябе, прарокам для народаў Я паставіў цябе».
6 А я сказаў: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ! Вось, я ня ўмею гаварыць, бо я яшчэ юнак!»
7 І сказаў ГОСПАД мне: «Не кажы: "Я юнак", бо да ўсіх, да каго Я цябе пашлю, ты пойдзеш, і
ўсё, што Я табе загадаю, будзеш казаць.
8 Ня бойся абліччаў іхніх, бо Я з табою, каб цябе захоўваць, кажа ГОСПАД».
9 І выцягнуў ГОСПАД руку Сваю, і дакрануўся да вуснаў маіх, і сказаў ГОСПАД мне: «Вось, Я
кладу слова Маё ў вусны твае.
10 Глядзі, Я стаўлю цябе сёньня над народамі і валадарствамі, каб вырываў і разбураў, каб
нішчыў і руйнаваў, каб садзіў і будаваў».
11 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы: «Што ты бачыш, Ярэмія?» І я сказаў: «Бачу галінку
дрэва мігдалёвага».
12 І сказаў ГОСПАД мне: «Добра бачыш, бо Я пільную слова Маё, каб споўніць яго».
13 І было слова ГОСПАДА да мяне другі раз, кажучы: «Што ты бачыш?» Я адказаў: «Бачу кацёл,
які кіпіць, і аблічча ягонае [нахілена] з паўночнага боку».
14 І сказаў мне ГОСПАД: «З поўначы прыйдзе загуба на ўсіх жыхароў зямлі.
15 Бо вось, Я паклічу плямёны валадарстваў поўначы, кажа ГОСПАД, і яны прыйдуць, і
паставяць кожны пасад свой каля ўваходу ў брамы Ерусаліму і супраць усіх муроў ягоных
навокал, і супраць усіх гарадоў Юды.
16 І Я выдам прысуд на іх за ўсю ліхоту іхнюю, што пакінулі Мяне, і кадзілі багам чужым, і
пакланяліся творам рук сваіх.
17 А ты падпержы сьцёгны твае і ўстань, і прамоў да іх усё, што Я табе загадаю. Ня бойся
абліччаў іхніх, каб Я не напоўніў цябе страхам перад абліччам іхнім.
18 І вось, сёньня Я раблю цябе горадам умацаваным, слупом жалезным і мурам мядзяным
супраць усёй зямлі гэтай, супраць валадароў Юды, супраць князёў іхніх, супраць сьвятароў
іхніх і супраць народу зямлі гэтай.
19 І яны будуць ваяваць супраць цябе, але не перамогуць цябе, бо Я з табою, кажа ГОСПАД, каб
ратаваць цябе».

Яр 2

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Ідзі і абвяшчай у вушы Ерусаліму, кажучы: "Гэта кажа ГОСПАД. Я памятаю міласьць
маладосьці тваёй і любоў, калі ты была нарачонаю, калі ты хадзіла за Мною ў пустыні, у зямлі,
якой ніхто не засявае.
3 Ізраіль — гэта сьвятасьць для ГОСПАДА, першы плод Ягоны. Усе, што ядуць яго, робяцца
вінаватымі, няшчасьце прыходзіць на іх, кажа ГОСПАД.
4 Слухайце слова ГОСПАДА, дом Якуба і ўсе сем'і дому Ізраіля!
5 Гэта кажа ГОСПАД. Што благога знайшлі ў-ва Мне бацькі вашыя, што адыйшлі ад Мяне і
пайшлі за марнотай, і самі сталіся марнасьцю.
6 І яны не казалі: "Дзе ГОСПАД, Які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай, вёў нас праз пустыню, праз
зямлю неабжытую і поўную ямаў, праз зямлю сухую і цёмную, праз зямлю, па якой ніхто ня
ходзіць, і ніводзін чалавек там не жыве?"

7 А Я ўвёў вас у зямлю ўрадлівую, каб вы елі плады ейныя і даброцьці ейныя. І вы ўвайшлі, і
спаганілі зямлю Маю, і зрабілі агідай спадчыну Маю.
8 Сьвятары не казалі: “Дзе ГОСПАД?” І тыя, што трымаюць Закон, ня ведалі Мяне; і пастухі
паўсталі супраць Мяне, і прарокі прарочылі на карысьць Баала і пайшлі за тымі, якія не даюць
дапамогі.
9 Дзеля таго буду далей спрачацца з вамі, кажа ГОСПАД, і сыноў сыноў вашых буду вінаваціць.
10 Пайдзіце на астравы Кіттым і паглядзіце, пашліце ў Кедар і прасачыце добра, ці сталася там
нешта падобнае?
11 Ці [нейкі] народ зьмяніў багоў? А яны зусім ня Бог! А народ Мой зьмяніў славу сваю на тое,
што ня можа дапамагчы!
12 Аслупянейце, нябёсы, дзеля гэтага, і дрыжыце, і палохайцеся, кажа ГОСПАД.
13 Бо падвойнае ліха ўчыніў народ Мой: пакінулі Мяне, крыніцу вады жывой, каб выкапаць
для сябе сажалкі, сажалкі дзіравыя, якія ня могуць трымаць вады.
14 Ці ж Ізраіль — слуга? Ці ён — [нявольнік], які народжаны ў доме? Чаму ж ён стаўся
здабычай?
15 Над ім рыкаюць ільвы, выяўляючы голас свой; яны перамянілі зямлю ягоную ў пустэчу, і
гарады ягоныя спаленыя, няма каму жыць у іх.
16 Таксама сыны Нофу і Тахпанхэсу абгалілі табе галаву.
17 Ці ж не зрабілася з табою гэта з-за таго, што ты пакінуў ГОСПАДА, Бога твайго, калі Ён вёў
цябе дарогаю?
18 І цяпер, навошта табе шлях у Эгіпет, каб піць ваду з Нілу? І навошта табе шлях у Асірыю, каб
піць ваду з ракі?
19 Карае цябе ліхота твая, і адступніцтва тваё асуджае цябе. Дык ведай і пабач, што ліхім і
горкім ёсьць тое, што ты пакінуў ГОСПАДА, Бога твайго, і ня маеш страху Майго ў табе, кажа
Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў.
20 Бо здаўна ты зламала ярмо тваё, парвала путы твае і сказала: “Ня буду служыць!” На
кожным узгорку высокім і пад кожным дрэвам зялёным ты лажылася як распусьніца.
21 А Я пасадзіў цябе як выборную лазу вінаградную, лазу з насеньня праўдзівага. І як жа ты
ператварылася ў Мяне на дзічку вінаграду звыраднелага?
22 Нават калі ты будзеш мыцца содаю і будзеш ужываць шмат мыла, пляма беззаконьня твайго
[застанецца] перад абліччам Маім, кажа Госпад ГОСПАД.
23 Як ты можаш казаць: “Я не апаганеная, я за Бааламі не хадзіла”? Паглядзі на шляхі твае ў
даліне, даведайся, што ты зрабіла, маладая, хуткая вярблюдзіца, якая кідаецца ў-ва ўсе бакі.
24 [Ты — як] дзікая асьліца, якая прывыкла да пустыні, якая ў пажаданьні душы сваёй уцягвае
паветра, і жарсьць ейную хто стрымае? Усе, хто шукаюць яе, ня мусяць намагацца, яны
знойдуць яе ў месяцы ейныя.
25 Стрымай нагу тваю ад голасьці, і горла тваё ад прагненьня. А ты кажаш: “Надарма, ніколі!
Бо я люблю чужынцаў і пайду за імі!”
26 Як асаромлены злодзей, калі зловяць яго, так асаромлены дом Ізраіля, яны і валадары іхнія,
і князі іхнія, і сьвятары іхнія, і прарокі іхнія,
27 якія кажуць дрэву: “Ты — бацька мой”, і камяню: “Ты мяне нарадзіў”. Бо яны павярнуліся
да Мяне плячыма, а не абліччам, але ў часе гора свайго клічуць: “Устань і ратуй нас!”
28 Дзе богі твае, якіх ты для сябе зрабіў? Няхай яны ўстануць, каб ратаваць цябе ў час гора
твайго. Бо які лік гарадоў тваіх, столькі багоў тваіх, Юда!
29 Навошта вы спрачаецеся са Мною? Усе вы адступіліся ад Мяне, кажа ГОСПАД.
30 Надарма Я караў сыноў вашых, настаўленьня вы не прынялі. Прарокаў вашых пазьядаў меч
ваш нібы леў нішчыцель.
31 Што вы за пакаленьне? Даведайцеся слова ГОСПАДА. Ці ж Я быў пустыняй для Ізраіля або
зямлёй цемры? Дзеля чаго кажа народ Мой: “Мы вызваліліся! Ня прыйдзем больш да Цябе!”
32 Ці ж дзяўчына забудзецца пра аздобы свае, а нарачоная — пра стужкі свае? А народ Мой
забыўся пра Мяне ўжо безьліч дзён.

33 Якая спраўная ты на шляху сваім, каб шукаць каханьня! Таму ты прывучыла шляхі свае да ліхоты!
34 На краях шатаў тваіх — кроў душаў нявінных і ўбогіх, якіх ты не злавіла на зладзействе. Але ты не глядзіш на гэта.
35 Ты кажаш: “Я невінаватая, гнеў Ягоны хіба адвярнуўся ад мяне”. Вось, Я буду судзіць цябе, бо ты сказала: “Я не саграшыла”.
36 Як лёгка ты мяняеш шляхі твае! Таксама Эгіпет асароміць цябе, як асароміла цябе Асірыя.
37 Таксама ад яго зыйдзеш ты, і рукі твае [будуць] на галаве тваёй, бо ГОСПАД адкінуў тых, на якіх ты спадзявалася, і ты ня будзеш мець посьпеху з імі”».

Яр 3

1 І [было] сказана: «Калі муж адпусьціць жонку сваю, і яна адыйдзе ад яго і пойдзе замуж за іншага мужа, ці можа ён вярнуцца да яе? Ці ж, апаганіўшыся, не апаганена зямля тая? А ты чужаложыла з многімі каханкамі. І ты вернешся да Мяне? — кажа ГОСПАД.
2 Падымі вочы твае на ўзгоркі і паглядзі, дзе [месца], на якім бы ты не лажылася для распусты? Пры шляхах сядзела ты, [чакаючы] на іх, як Араб у пустыні, і апаганіла зямлю распустаю тваёй і ліхотаю тваёй.
3 І спыніліся залевы, і дажджу вясновага не было, але было ў цябе чало жанчыны чужаложнай і ты страціла сорам.
4 Ці ж цяпер, клічучы, ты будзеш клікаць Мяне: “Ойча мой! Ты — сябра маладосьці маёй!
5 Ці будзеш гневацца вечна або захоўваць крыўду?” Вось, ты, кажучы, казала, а [сама] рабіла ліхоту, калі была магчымасьць».
6 І сказаў мне ГОСПАД у дні валадара Ёсіі: «Ці ты бачыў, што зрабіла [дачка] Ізраіля, адступніца? Яна хадзіла на кожную гару высокую і пад кожнае дрэва зялёнае, і чыжаложыла там.
7 І Я падумаў: “Калі яна ўсё гэта зробіць, тады вернецца да Мяне”. Але яна не вярнулася. І гледзячы, угледзела гэта здрадлівая сястра ейная Юда.
8 І ўгледзела яна, што за ўсе ўчынкі, якімі чужаложыла [дачка] Ізраіля, адступніца, Я адпусьціў яе і даў ёй ліст разводны. І не ўстрывожылася здрадлівая Юда, сястра ейная, і пайшла, і таксама чужаложыла.
9 І сталася, праз розгалас пра распусту сваю яна апаганіла зямлю гэтую і чужаложыла з камянём і дрэвам.
10 І таксама пасьля ўсяго гэтага здрадлівая сястра ейная, Юда, не навярнулася да Мяне ўсім сэрцам, але толькі фальшыва, кажа ГОСПАД».
11 І ГОСПАД сказаў мне: «Больш праведная душа адступніцы, [дачкі] Ізраіля, чым у здрадлівай Юды.
12 Ідзі, і абвяшчай словы гэтыя на поўнач, і кажы: “Вярніся, адступніца, [дачка] Ізраіля, кажа ГОСПАД. Я не адвярну аблічча Маё ад вас, бо Я міласэрны, кажа ГОСПАД, ня буду гневацца на вякі.
13 Толькі зьведай беззаконьне тваё, што ты бунтавалася супраць ГОСПАДА, Бога твайго, і што бадзялася па ўсіх шляхах з чужынцамі пад кожным дрэвам зялёным, а голасу Майго ня слухала, кажа ГОСПАД.
14 Вярніцеся, сыны адступнікі, кажа ГОСПАД, бо Я — Гаспадар ваш; і Я вазьму вас, аднаго з кожнага гораду, і двух з кожнай сям’і, і завяду вас на Сыён.
15 І дам вам пастыраў паводле сэрца Майго і яны будуць пасьвіць вас разумна і разважна.
16 І будзе, што вы памножыцеся і будзеце пладзіцца на зямлі ў тыя дні, кажа ГОСПАД. Ніхто ня будзе больш казаць: “Каўчэг запавету ГОСПАДА”, і ня прыйдзе ён на сэрца ягонае, і ня будуць памятаць пра яго, ані адчуваць яго нястачы, і больш ня будзе зроблены.
17 У той час Ерусалім назавуць Пасадам ГОСПАДА. І зьбяруцца ў ім, у Ерусаліме, усе народы ў імя ГОСПАДА, і ня будуць ужо хадзіць паводле закамянеласьці сэрца ліхога свайго.
18 У тыя дні пойдзе дом Юды ў дом Ізраіля, і выйдуць разам з зямлі паўночнай у зямлю, якую Я даў у спадчыну бацькам вашым.

19 І Я сказаў: “Як Я залічу цябе як сына і дам табе найкаштоўнейшую зямлю, найпрыгажэйшую
спадчыну сярод народаў!” Я сказаў: “Вы будзеце клікаць Мяне ‘Ойча мой!’ і ад Мяне не
адвернецеся”.
20 Але як жонка здраджвае каханаму свайму, так вы здрадзілі Мне, дом Ізраіля, кажа ГОСПАД.
21 Чутны голас на ўзгорках, плач і лямант сыноў Ізраіля, бо яны апаганілі шлях свой, забыліся
пра ГОСПАДА, Бога свайго.
22 Вярніцеся, сыны адступнікі, Я вылечу адступніцтва вашае. “Вось, мы прыйшлі да Цябе, бо
Ты — ГОСПАД, Бог наш.
23 Сапраўды, узгоркі і гоман на гарах — падман. Сапраўды, у ГОСПАДЗЕ, Богу нашым,
збаўленьне Ізраіля.
24 Сорам зьядаў працу бацькоў нашых ад маладосьці нашай, авечак іхніх і валоў іхніх, сыноў
іхніх і дочак іхніх.
25 Мы ляжым у сораме нашым, і ганьба нашая нас пакрывае, бо мы зграшылі супраць ГОСПАДА,
Бога нашага, мы і бацькі нашыя, ад маладосьці нашай аж да дня гэтага, і ня слухалі мы голасу
ГОСПАДА, Бога нашага”.

Яр 4

1 Калі вернешся, Ізраіль, кажа ГОСПАД, вернешся да Мяне, і калі адкінеш ідалаў сваіх ад аблічча
Майго, ня будзеш бадзяцца.
2 І калі будзеш прысягаць: “Як жывы ГОСПАД!” у праўдзе, судзе і праведнасьці, народы будуць
дабраслаўляцца і будуць хваліцца ў Ім.
3 Бо гэта кажа ГОСПАД да людзей Юды і Ерусаліму: “Разорвайце разоры вашыя, і ня кідайце
насеньня ў церні.
4 Абрэжцеся дзеля ГОСПАДА і адкіньце скуравінкі сэрцаў вашых, мужы Юды і жыхары
Ерусаліму, бо выйдзе гнеў Мой, як агонь, і будзе гарэць, і не затухне з прычыны ліхіх учынкаў
вашых”.
5 Абвяшчайце ў Юдзе, і агаласіце ў Ерусаліме, і скажыце: “Трубіце ў трубы па ўсёй зямлі,
крычыце моцна і кажыце: ‘Зьбіраймася і хадземце ў гарады ўмацаваныя!”
6 Падыміце знак у напрамку Сыёну! Уцякайце! Не затрымлівайцеся! Бо Я прыводжу гора з
поўначы і няшчасьце вялікае.
7 Выйшаў леў з гушчара свайго і нішчыцель народаў вырушыў. Пакінуў ён сваё месца
паселішча, каб зрабіць зямлю тваю пусткаю; гарады твае будуць разбураны і без жыхароў.
8 Дзеля гэтага апраніце зрэбніцу, лямантуйце і галасіце, бо не адвярнулася ад вас ярасьць
гневу ГОСПАДА.
9 І станецца ў тыя дні, кажа ГОСПАД, спыніцца сэрца валадара і сэрца князёў, і аслупянеюць
сьвятары, і прарокі зьнямеюць.
10 І скажуць: “Госпадзе ГОСПАДЗЕ! Падманваючы, падмануў Ты народ гэты і Ерусалім, калі
казаў: "Супакой будзе вам", а вось меч дакрануўся да душы”.
11 У той час будуць казаць народу гэтаму і Ерусаліму: “Вецер гарачы з гораў, што ў пустыні,
[прыходзіць] на шлях дачкі народу Майго не для прасяваньня і не для ачышчэньня.
12 Вецер, мацнейшы за яго, прыйдзе ад Мяне. Цяпер Я праслаўлю суд над імі”.
13 Вось, ён падымаецца, нібы хмары, і як бура калясьніцы ягоныя, хутчэйшыя, чым арлы, коні
ягоныя. “Гора нам, бо мы будзем зьнішчаны!”
14 Абмый ад ліхоты сэрца тваё, Ерусалім, каб ты быў уратаваны! Дакуль жа будуць у табе думкі
твае нягодныя?
15 Бо голас абвяшчае з Дана і агалашаюць загубу з гор Эфраіма.
16 Паведамце народам: “Вось яны!” Абвясьціце гэта ў Ерусаліме: “Прыходзяць з зямлі
далёкай, каб аблягаць яго, супраць гарадоў Юды ўзносяць голас свой!
17 Як вартаўнікі палёў, яны атачаюць яго навокал, бо ён збунтаваўся супраць Мяне, кажа
ГОСПАД.
18 Шляхі твае і ўчынкі твае зрабілі гэта табе. Беззаконьне тваё такое горкае, што сягае нават
сэрца твайго!”

19 “Улоньне маё, улоньне маё! Я качаюся ад болю! Сьцены сэрца майго! Трапеча ў-ва мне
сэрца маё! Не магу маўчаць, бо гук трубы чуе душа мая, гармідар ваенны”.
20 “Бяда за бядою абвяшчаюцца, бо зруйнаваная ўся зямля, зьнянацку зьнішчаны намёты Мае,
у момант — заслона Мая.
21 Дакуль Я буду глядзець на знакі і слухаць голас трубы?
22 Бо неразумны народ Мой, ня ведае Мяне; сыны дурныя і бязглуздыя; мудрыя, каб чыніць
зло, але добрага рабіць ня ўмеюць.
23 Я зірнуў на зямлю, і вось, яна бязладная і пустая; [зірнуў] на неба — і няма сьвятла ягонага.
24 Зірнуў на горы, і вось, яны трасуцца, і ўсе ўзгоркі хістаюцца.
25 Зірнуў, і вось, няма чалавека, і зьніклі ўсе птушкі нябесныя.
26 Зірнуў, і вось, зямля ўрадлівая [сталася] пустыняй, і ўсе гарады зьнішчаныя перад абліччам
ГОСПАДА, перад абліччам полымя гневу Ягонага”.
27 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Спустошана будзе ўся зямля, але загубы поўнай Я не зраблю.
28 Дзеля гэтага будзе галасіць зямля і зацемрыцца неба ўгары. Бо Я прамовіў гэтак, і так
вырашыў, і ня буду шкадаваць, і ад гэтага не адступлюся”.
29 Ад голасу вершніка і страляньня з луку ўцякуць усе гарады. Кінуцца ў гушчары, ушчэпяцца
на скалы, усе гарады будуць пакінутыя, ніводзін чалавек ня будзе жыць у іх.
30 А ты, зруйнаваная, што будзеш рабіць? Хоць апранешся ў кармазын, хоць начэпіш аздобы
залатыя і падмалюеш фарбай вочы твае, надарма ўпрыгожваешся, бо пагарджаюць табою
палюбоўнікі твае, цікуюць яны на жыццё тваё.
31 Чую голас быццам парадзіхі, нібы стогн жанчыны, якая першы раз нараджае, голас дачкі
Сыёну, якая памірае і выцягвае рукі свае: “Гора мне, бо млее душа мая між забойцаў!”

Яр 5

1 Аббяжыце вуліцы Ерусаліму, паглядзіце і прасачыце, і абшукайце на пляцах ягоных, ці
знойдзеце чалавека, ці няма таго, хто чыніць суд, шукае праўды, і Я прабачу ім.
2 Калі яны кажуць: “Як жывы ГОСПАД!”, яны прысягаюць фальшыва.
3 ГОСПАДЗЕ, ці ж вочы Твае ня [зьвернуты] да праўды? Ты ўдарыў іх, а ім не баліць, Ты
панішчыў іх, а яны адмовіліся прыняць настаўленьне; яны закамянілі абліччы свае горш за
скалу і адмовіліся навярнуцца.
4 І Я сказаў: “Толькі людзі простыя робяць неразважна, бо яны ня ведаюць шляху ГОСПАДА,
суду Бога свайго
5 Дык Я пайду да людзей вялікіх і прамоўлю да іх, бо яны ведаюць шлях ГОСПАДА, суд Бога
свайго”. Але яны таксама паламалі ярмо і парвалі путы.
6 Дзеля гэтага зьнішчыць іх леў з лесу і воўк стэповы выгубіць іх, пантэра будзе цікаваць каля
гарадоў іхніх, кожны, хто выйдзе з іх, будзе разарваны, бо шматлікія грахі іхнія, пашырыліся
адступніцтвы іхнія.
7 Навошта Я маю быць да цябе літасьцівы? Сыны твае пакінулі Мяне і прысягалі на тых, якія
ня богі. І Я насыціў іх, а яны чужаложылі і зьбіраліся ў доме чужаложніцы.
8 Яны сталіся як коні незацугляныя, кожны іржэ да жонкі бліжняга свайго.
9 Ці ж Я за гэта ня буду караць, кажа ГОСПАД, і ці народу такому не адпомсьціць душа Мая?
10 Узыйдзіце на муры ягоныя і разбурайце іх, але поўнага зьнішчэньня не рабіце, зьнішчыце
падпоры ягоныя, бо яны не для ГОСПАДА.
11 Бо здраджваючы, здрадзіў Мне дом Ізраіля і дом Юды, кажа ГОСПАД.
12 Яны выракліся ГОСПАДА і казалі: “Няма Яго. Ня прыйдзе на нас ліха, мы ня ўбачым ані
мяча, ані голаду”.
13 Прарокі будуць як вецер, і ня будзе ў іх слова. І гэтак ім станецца.
14 Таму гэта кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў. За тое, што вы гаварылі слова гэтае, вось, Я зраблю
словы Мае ў вуснах тваіх агнём, а народ гэты — дровамі, і [агонь] зжарэ іх.
15 Вось, Я навяду на вас, дом Ізраіля, народ здалёк, кажа ГОСПАД, народ дужы, народ
старадаўні, народ, мовы якога ты ня ведаеш, і не разумееш, што ён гаворыць.

16 Сагайдак ягоны — быццам труна адкрытая; усе яны — волаты.
17 І зьесьць ён жніво тваё і хлеб твой, зьесьць сыноў тваіх і дочак тваіх, зьесьць авечак тваіх
і быдла тваё, зьесьць вінаграднікі твае і дрэвы фігавыя твае, зьнішчыць мячом умацаваныя
гарады твае, на якія ты спадзяваўся.
18 Але ў тыя дні, кажа ГОСПАД, Я не зраблю, [што будзе] вам канец.
19 І станецца, калі скажуць: "За што зрабіў нам усё гэта ГОСПАД, Бог наш?", ты скажаш ім:
"Як вы пакінулі Мяне і служылі багам чужым у зямлі сваёй, так будзеце служыць чужынцам
у зямлі ня вашай"
20 Паведамце пра гэта дому Якуба, і абвясьціце гэта ў Юдзе, кажучы:
21 "Паслухай гэта, прашу, народ бяз розуму і бяз сэрца, які мае вочы, і ня бачыць, мае вушы, і
ня чуе.
22 Вы не баіцёся Мяне, кажа ГОСПАД, не трымціце перад абліччам Маім. Я паставіў пясок
мяжой для мора як мяжу вечную, якую яно не пераступіць; хоць паўстануць [хвалі], але ня
змогуць, і будуць шалець хвалі, але не перакрочаць [мяжы].
23 А ў гэтага народу сэрца ўпартае і бунтаўнічае; яны адступіліся і адыйшлі,
24 і не сказалі ў сэрцы сваім: "Мы будзем баяцца ГОСПАДА, Бога нашага, Які дае нам дождж у
свой час, дождж раньні і позьні, Які захоўвае для нас вызначаныя тыдні жніва".
25 Беззаконьне вашае ўхіліла гэта, і грахі вашыя стрымалі даброцьці гэтыя,
26 бо знайшліся ў народзе Маім бязбожнікі, якія цікуюць як птушкаловы, стаўляюць пасткі,
ловяць людзей.
27 Як клетка поўная птушак, так дамы іхнія поўныя падману, і такім чынам яны становяцца
слаўнымі і багатымі,
28 сытымі і гладкімі, і перакрочваюць усякую меру зла. Яны ня судзяць справядліва справу
сіраты, і маюць посьпех, і судовую [справу] ўбогіх не разглядаюць.
29 Ці ж за гэта Я ня буду караць іх, кажа ГОСПАД, і ці ж народу такому не адпомсьціць душа
Мая?
30 Дзіўнае і жудаснае дзеецца ў зямлі гэтай:
31 прарокі прарочаць ілжыва, сьвятары навучаюць як хочуць, і народ Мой любіць гэта. Але што
вы будзеце рабіць, калі [прыйдзе] гэтаму канец?"

Яр 6

1 Уцякайце, сыны Бэн'яміна, з сярэдзіны Ерусаліму і ў Тэкоа трубіце ў трубы, і над Бэт-
Гакерэмам падыміце знак, бо з поўначы надыходзіць бяда і спусташэньне вялікае.
2 Я спустошу дачку Сыёну, прыгожую і далікатную.
3 Да яе прыйдуць пастухі са статкамі сваімі, паставяць намёты навокал яе, і будуць пасьвіць
кожны, дзе хоча.
4 "Падрыхтуйцеся да вайны супраць яе, устаньце, і нападзем апоўдні". "Гора нам, бо дзень
мінае, бо даўжэйшыя сталі цені вечаровыя!"
5 "Устаньце, і мы нападзем уначы і зьнішчым палацы ейныя".
6 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: "Сьсячыце дрэвы і насыпце вал кругом Ерусаліму. Гэты
горад мае быць пакараны, усякая поскудзь у сярэдзіне яго.
7 Як крыніца вылівае ваду сваю, так ён вылівае крывадушнасьць сваю. Гвалт і ўціск чуваць у
ім, раны і хвароба заўсёды перад абліччам Маім.
8 Будзь навучаны, Ерусаліме, каб не адвярнулася душа Мая ад цябе, каб Я не замяніў цябе ў
пустэчу, зямлю бязьлюдную".
9 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: "Абіраючы, абяруць, як вінаград, рэшту Ізраіля. Выцягні руку
тваю, як вінаградар да гронак".
10 Да каго я маю казаць і каго перасьцерагаць, каб паслухаў? Вось, неабрэзанае вуха іхняе, і ня
могуць яны чуць. Вось, слова ГОСПАДА сталася для іх у насьмешку, і яны не жадаюць яго.
11 І я поўны гневу ГОСПАДА, я змучыўся, стрымліваючы [яго]. Выльлю яго на дзяцей на вуліцы
і на сход юнакоў! Бо будуць забраныя муж разам з жонкаю, стары і чалавек у гадах пажылых.

12 І пяройдуць дамы іхнія да іншых, падобна як палі і жанчыны, бо Я выцягваю руку Маю на
жыхароў зямлі гэтай, кажа ГОСПАД.
13 Бо ад найменшага аж да найбольшага ахапіла ўсіх прагнасьць зыску, ад прарока аж да
сьвятара, усе робяць падман.
14 І яны лечаць рану народу Майго легкадумна, кажучы: “Мір, мір”, а міру няма.
15 Ці засаромеліся яны, што брыдоту рабілі? Але сорамам яны не саромеюцца і чырванець
ня ўмеюць. Дзеля таго яны ўпадуць сярод тых, якія падаюць, і ў час, калі Я наведаю іх,
спатыкнуцца, кажа ГОСПАД.
16 Гэта кажа ГОСПАД: “Спыніцеся на шляхах, і паглядзіце, і спытайцеся пра сьцежкі
старадаўнія, дзе шлях добры, і ідзіце па ім, і знойдзеце супакой душам вашым”. Але яны
сказалі: “Ня пойдзем!”
17 І Я паставіў вартаўнікоў для вас [кажучы]: “Слухайце голас трубы!” Але яны сказалі: “Ня
будзем слухаць!”
18 Дык слухайце, народы, і зразумейце, грамада, што [станецца] з імі.
19 Слухай, зямля! Вось, Я навяду гора на народ гэты, плод намераў іхніх, бо яны не зважалі на
словы Мае і Закон Мой адкінулі.
20 Навошта Мне кадзіла, прывезенае з Шэвы, і трысьнёг пахкі з зямлі далёкай? Цэласпаленьні
вашыя недаспадобы [Мне], і ахвяры вашыя не падабаюцца Мне.
21 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: “Вось, Я дам народу гэтаму перашкоды, аб якія спатыкнуцца
бацькі і сыны, таксама сусед і сябар ягоны, гінучы, загінуць”.
22 Гэта кажа ГОСПАД: “Вось, народ прыходзіць з зямлі паўночнай, і народ вялікі падымаецца
з канцоў зямлі.
23 Лук і дзіду яны трымаюць, жудасныя яны і ня маюць літасьці, голас іхні як мора шуміць, і
яны на конях едуць, пашыхтаваныя, як чалавек да бою супраць цябе, дачка Сыёну!”
24 Мы пачулі вестку пра яго, і самлелі рукі нашыя, трывога ахапіла нас і боль як у той, якая
нараджае.
25 Не выходзьце, выходзячы, у поле і не зьбірайцеся, зьбіраючыся ў дарогу, бо меч ворага і
трывога навокал.
26 Дачка народу Майго, апраніся ў зрэбніцу і качайся ў попеле; учыні жалобу, як па сыну
адзіным, лямантуй горка, бо раптоўна прыйдзе на нас нішчыцель.
27 Я паставіў цябе як вежу ў народзе Маім і як цьвярдыню, каб ты даведаўся і выспрабаваў шлях
іхні.
28 Усе яны — адступнікі з адступнікаў, ходзяць нахабна, усе яны — медзь і жалеза, усе
папсаваныя.
29 Разагрэты мяхом кавальскім агонь, зьнікла волава, але надарэмна ператапляе той, які
ператапляе, бо ліхія не аддзяляюцца.
30 Называюць іх срэбрам адкінутым, бо адкінуў іх ГОСПАД».

Яр 7

1 Слова, якое было да Ярэміі ад ГОСПАДА, кажучы:
2 «Стань у браме Дому ГОСПАДА і абвяшчай там слова гэтае, і кажы: “Слухайце слова ГОСПАДА,
усе з Юды, якія ўваходзіце праз брамы гэтыя, каб пакланіцца ГОСПАДУ.
3 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Выпраўце шляхі вашыя і ўчынкі вашыя, і Я дазволю
вам жыць на месцы гэтым.
4 Не спадзявайцеся на словы хлуслівыя, якія кажуць: “Сьвятыня ГОСПАДА, сьвятыня ГОСПАДА,
сьвятыня ГОСПАДА!”
5 Бо калі вы, выпраўляючы, выправіце шляхі вашыя і ўчынкі вашыя, і калі, чынячы [суд], будзе
чыніць суд адзін адносна другога,
6 калі ня будзеце крыўдзіць чужынца, сірату і ўдаву, і ня будзеце праліваць крыві нявіннай на
месцы гэтым, і калі ня пойдзеце за іншымі багамі сабе на гора,
7 Я дазволю вам жыць на месцы гэтым, у зямлі, якую Я даў бацькам вашым ад вякоў і на вякі.
8 Вось, вы спадзяецеся на словы фальшывыя, якія не дапамагаюць.

9 Вы будзеце красьці, забіваць, чужаложыць, прысягаць фальшыва, паліць кадзіла Баалу,
хадзіць за іншымі багамі, якіх ня ведаеце,
10 а [потым] прыйдзеце і станеце перад абліччам Маім у Доме гэтым, над якім клічуць імя
Маё, і скажаце: “Мы выратаваныя”, каб і далей рабіць усе гэтыя брыдоты?
11 Хіба пячорай разбойнікаў стаўся ў вачах вашых Дом гэты, над якім клічуць імя Маё? Але Я
гэта бачу, кажа ГОСПАД.
12 Ідзіце, прашу, да месца Майго ў Шыло, дзе даўней выбраў Я сялібу для імя Майго, і
паглядзіце, што Я зрабіў яму з прычыны ліхоцьця народу Майго, Ізраіля.
13 А цяпер, за тое, што вы ўчынілі ўсе справы гэтыя, кажа ГОСПАД, і Я прамаўляў да вас,
прамаўляючы безупынна, а вы ня слухалі, і клікаў вас, а вы не адгукаліся,
14 Я зраблю Дому гэтаму, над якім клічуць імя Маё і на які вы спадзяецеся, і месцу гэтаму, якое
Я даў вам і бацькам вашым, тое самае, што Я зрабіў з Шыло.
15 І Я адкіну вас ад аблічча Майго, як Я адкінуў усіх братоў вашых, усё насеньне Эфраіма.
16 А ты не маліся за народ гэты, і ня ўзнось просьбы і малітвы за іх, і не заступайся перада
Мною, бо Я ня выслухаю цябе.
17 Ці ты ня бачыш, што робіцца ў гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму?
18 Сыны зьбіраюць дровы, бацькі распальваюць агонь, а жанчыны месяць цеста, каб нарабіць
аладак для “валадаркі нябеснай”, і выліваюць ахвяры вадкія для багоў чужых, каб абражаць
Мяне.
19 Ці Мяне яны абражаюць, кажа ГОСПАД, ці больш сябе, на ганьбу абліччаў сваіх?
20 Таму гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, гнеў Мой і ярасьць Мая выліваецца на месца гэтае,
на чалавека і на жывёлу, на дрэвы палявыя і на плады зямлі, ён гарыць і не затухае”.
21 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Дадавайце цэласпаленьні вашыя да ахвяраў
вашых і ешце мяса!”
22 Бо Я не прамаўляў да бацькоў вашых і не загадваў ім у дзень, калі выводзіў іх з зямлі
Эгіпецкай, адносна цэласпаленьняў і ахвяраў,
23 але загадаў ім слова гэтае, кажучы: “Слухайце голас Мой, і Я буду вам Богам, а вы будзеце
Мне народам. Хадзіце ўсякім шляхам, якім Я загадаў вам [ісьці], каб вам добра было”.
24 Але яны не паслухалі і не прыхілілі вуха сваё, і пайшлі паводле закамянеласьці сэрца свайго
ліхога, і павярнуліся [да Мяне] плячыма, а не абліччам.
25 Ад дня, калі бацькі вашыя выйшлі з зямлі Эгіпецкай аж да дня гэтага Я, пасылаючы, пасылаў
да вас усіх слугаў Маіх, прарокаў, штодня безупынна,
26 але вы ня слухалі Мяне, і не прыхілілі вуха сваё, і зрабілі цьвёрдым карак свой, і сталіся
горшымі, чым бацькі вашыя”.
27 І ты прамовіш да іх усе словы гэтыя, але яны не паслухаюць цябе, і будзеш клікаць іх, але
яны не адгукнуцца.
28 І ты скажаш ім: “Гэта народ, які не паслухаў голасу ГОСПАДА, Бога свайго, і не прыняў
настаўленьня”. Зьнікла праўда, счэзла з вуснаў іхніх!
29 Абстрыжы валасы твае і адкінь [іх], і падымі лямант на вышынях, бо адкінуў ГОСПАД і
пакінуў пакаленьне гневу Ягонага.
30 Бо сыны Юды чыняць зло на вачах Маіх, кажа ГОСПАД, паставілі ідалаў сваіх у доме, над
якім клічуць імя Маё, каб зьняважыць Яго.
31 І пабудавалі ўзгорак Тафэт у лагчыне Бэн-Гінном, каб паліць у агні сыноў сваіх і дачок сваіх,
а гэтага Я не загадваў ім, і не прыйшло гэта на сэрца Маё.
32 Дзеля гэтага прыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і ня будуць казаць пра Тафэт або пра лагчыну
Бэн-Гінном, але пра Даліну забойства, і ў Тафэце будуць хаваць памёршых дзеля нястачы
[іншага] месца.
33 І стануцца трупы народу гэтага пажывай для птушак нябесных і для зьвяроў зямлі, і ніхто
ня будзе адганяць [іх].
34 І Я зраблю, што зьнікне ў гарадах Юды і ў Ерусаліме голас радасьці і голас вясёласьці, голас
жаніха і голас нявесты, бо пусткай станецца зямля гэтая.

Яр 8

1 У той час, кажа ГОСПАД, выкідаючы, выкінуць з магілаў іхніх косткі валадароў Юды, косткі
князёў іхніх, косткі сьвятароў, косткі прарокаў, косткі жыхароў Ерусаліму.
2 І выкінуць іх перад сонцам, і перад месяцам, і перад усім войскам нябесным, якія яны любілі,
і якім служылі, і за якімі хадзілі, і якіх шукалі, і якім пакланяліся.
3 І будзе выбіраць лепш сьмерць, чым жыцьцё, уся рэшта, якая застанецца з роду гэтага ліхога
ў-ва ўсіх месцах, у якія Я выганю іх, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
4 І ты скажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД. Хіба падаюць, і не ўстаюць? Хіба той, які адступіў, ня
вернецца [назад]?
5 Чаму адступіў гэты народ Ерусаліму і ўсьцяж у адступніцтве [трывае]? Яны ўхапіліся за
падман, і ня хочуць навярнуцца”.
6 Я зважаў і слухаў. Ніхто не прамаўляе [праўдзіва], няма нікога, хто каецца з прычыны ліхоты
сваёй, кажучы: “Што ж я нарабіў?” Кожны бяжыць у бегу сваім, як конь, які нясецца ў бітве.
7 Нават бусел у небе ведае пару сваю, туркаўка, ластаўка і жораў захоўваюць час прылёту
свайго, а народ Мой ня ведае суду ГОСПАДА.
8 Як вы можаце казаць: “Мы — мудрыя, з намі Закон ГОСПАДА”? Сапраўды, хлуслівае пяро
пісараў зрабіла яго хлусьнёю.
9 Мудрыя будуць асаромлены, спалоханы і злоўлены. Вось, яны адкінулі слова ГОСПАДА,
навошта ім мудрасьць?
10 Дзеля таго жонак іхніх Я аддам іншым, палі іхнія — [іншым] уласьнікам, бо ад найменшага
да найбольшага яны хцівыя да зыску. Ад прарока да сьвятара ўсе робяць хлусьню.
11 І лечаць раны дачкі народу Майго легкадумна, кажучы: “Мір, мір”, а міру няма.
12 Яны павінны саромецца, бо брыдоту рабілі. Але сорамам яны не саромяцца і чырванець
ня ўмеюць. Дзеля таго ўпадуць яны паміж тых, якія падаюць, і ў час, калі Я наведваю іх, яны
спатыкнуцца, кажа ГОСПАД.
13 Зьбіраючы, зьбяру іх, кажа ГОСПАД, ня будзе ані гронак на вінаградзе, ані фігаў на дрэве
фігавым, і лістота зьвяне.
14 “Чаму ж мы сядзім? Зьбірайцеся і пойдзем у гарады ўмацаваныя, і там загінем, бо ГОСПАД,
Бог наш, аддаў нас на загубу, і поіць нас вадой атрутнай, бо мы саграшылі супраць ГОСПАДА.
15 Мы чакаем міру, але няма нічога добрага, [чакаем] часу аздараўленьня, а вось, трывога!”
16 Ад Дана чуваць хрыпеньне коней іхніх, ад голасу іржаньня жарабцоў іхніх дрыжыць уся
зямля. І прыйдуць яны, і зжаруць усю зямлю і поўню яе, горад і жыхароў ягоных у ім.
17 Вось, Я пасылаю супраць вас зьмеяў атрутных, ад якіх няма замовы, і яны будуць кусаць вас,
кажа ГОСПАД.
18 Вясёласьць мая [перамянілася] ў смутак, і сэрца маё млее ў-ва мне.
19 Вось, голас ляманту дачкі народу Майго з зямлі далёкай: “Няўжо няма ГОСПАДА на Сыёне?
Няўжо няма ў ім валадара Ягонага?” Навошта яны зьневажалі Мяне ідаламі сваімі, марнымі
[багамі] чужымі?
20 Прайшло жніво, скончылася лета, а мы ня збаўленыя!
21 Дзеля няшчасьця дачкі народу майго я зламаны і сумны; жах ахапіў мяне.
22 Няўжо няма бальзаму ў Гілеадзе? Няўжо няма таго, хто лечыць? Дык чаму няма
аздараўленьня для дачкі народу майго?

Яр 9

1 Хто зробіць галаву маю [крыніцай] вады, а вочы мае — фантанам сьлёзаў, і я буду ўдзень і
ўначы плакаць дзеля забітых дачкі народу майго?
2 Хто дасьць мне ў пустыні прыстанішча, каб я мог пакінуць народ мой і адыйсьціся ад яго?
Бо ўсе яны — чужаложнікі, зборышча здраднікаў.
3 Яны напінаюць язык свой [быццам] лук, хлусьня і няпраўда ўмацаваліся на зямлі, бо ад
ліхоты ідуць да ліхоты, а Мяне ня ведаюць, кажа ГОСПАД.

4 Высьцерагаюцца адзін аднаго, і брат да брата ня мае даверу, бо кожны брат, ашукваючы,
ашуквае, і кожны бліжні ачарняе падступна.
5 Чалавек падманвае бліжняга свайго і праўды ня кажа, яны прывучылі язык свой прамаўляць
хлусьню, стаміліся, робячы ліхое.
6 Ты жывеш сярод падману, праз падман яны ня хочуць ведаць Мяне, кажа ГОСПАД.
7 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Вось, Я ператаплю іх і выспрабую іх, бо што іначай
магу ўчыніць адносна дачкі народу Майго?
8 Як страла згубная язык іхні, ашуканства кажуць вуснамі сваімі, гавораць бліжняму свайму
“супакой”, а ў нутры сваім рыхтуюць пастку.
9 Ці за гэта Я ня маю караць іх? — кажа ГОСПАД. Ці народу такому не адпомсьціць душа Мая?
10 У гарах Я ўзьніму плач і галашэньне, а на пашах у пустыні — сьпеў жалобны, бо яны
спаленыя, няма нікога, хто там праходзіць, і не чутно там рыку быдла; ад птушкі нябеснай
аж да дзікага зьвера ўсе разьбегліся, зьніклі.
11 І Я зраблю Ерусалім купай друзу і лежышчам цмокаў, а гарады Юды замяню на пустэчу, дзе
ніхто не жыве”.
12 Хто чалавек мудры і зразумее гэта? Да каго вусны ГОСПАДА прамовілі і абвясьцілі, чаму
загінула зямля, спаленая, як пустыня, дзе няма каму хадзіць?
13 І сказаў ГОСПАД: “За тое, што яны пакінулі Закон Мой, які Я даў перад абліччам іхнім, і ня
слухалі голас Мой, і не хадзілі паводле [Закону],
14 але пайшлі паводле закамянеласьці сэрца свайго і за Баалам, як навучылі іх бацькі іхнія”.
15 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Вось, Я накармлю народ гэты
палыном і напаю іх вадой атрутнай.
16 І Я расьцярушу іх сярод народаў, якіх ня ведаюць яны і бацькі іхнія, і пашлю ўсьлед за імі
меч, аж пакуль ня выгублю іх”.
17 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Зважце [на гэта] і паклічце плачак, няхай яны прыйдуць,
пашліце па мудрых, і няхай прыйдуць.
18 І няхай пасьпяшаюцца, і няхай узьнімуць дзеля нас галашэньне, і няхай пацякуць сьлёзы з
вачэй нашых, і няхай вада пацячэ з павекаў нашых”.
19 Бо голас галашэньня чуваць з Сыёну: “Як мы зьнішчаны, мы вельмі асаромленыя, бо мусім
пакінуць зямлю сваю, пакінуць паселішчы нашыя!”
20 Паслухайце, жанчыны, слова ГОСПАДА, і няхай прыймуць вушы вашыя слова вуснаў
Ягоных, і навучыце дочак вашых галашэньням, а адна другую — песьням жалобным.
21 Бо сьмерць улезла праз вокны нашыя, увайшла ў дамы нашыя, нішчыць дзяцей на вуліцах і
юнакоў на плошчах.
22 Прамаўляй гэтак, кажа ГОСПАД. І будуць ляжаць трупы чалавечыя, як гной на абліччы поля
і як снапы за жняцом, і няма каму зьбіраць [іх].
23 Гэта кажа ГОСПАД: “Няхай ня хваліцца мудры мудрасьцю сваёй, і няхай ня хваліцца асілак
сілаю сваёй, і няхай ня хваліцца багаты багацьцем сваім,
24 але хто хваліцца, няхай хваліцца тым, што ён разумны і ведае Мяне, што Я — ГОСПАД, Які
чыніць міласэрнасьць, суд і праведнасьць на зямлі, бо гэта падабаецца Мне, кажа ГОСПАД.
25 Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я наведаю ўсіх абрэзаных, але са скуравінкай,
26 Эгіпет, Юду, Эдом, сыноў Амона, Мааў і ўсіх, якія падразаюць валасы і жывуць у пустыні, бо
ўсе народы неабрэзаныя, а ўвесь дом Ізраіля — з неабрэзаным сэрцам”.

Яр 10

1 Слухайце слова, якое прамовіў ГОСПАД да вас, дом Ізраіля!
2 Гэта кажа ГОСПАД. Не вучыцеся шляху народаў гэтых і ня бойцеся знакаў нябесных, бо іх
баяцца народы гэтыя.
3 Бо боствы народаў — марнасьць, бо гэта дрэва, высечанае ў лесе, зробленае долатам у руках
разьбяра.
4 Аздабляюць іх срэбрам і золатам, прымацоўваюць іх малатком і цьвікамі, і яны не хістаюцца.

5 Яны — як пудзіла на гародзе, яны не гавораць і, носячы, носяць іх, бо ня ходзяць яны. Ня
бойцеся іх, бо ня могуць яны рабіць ані ліхое, ані добрае.
6 Няма такога, як Ты, ГОСПАДЗЕ! Ты вялікі, і вялікае імя магутнасьці Тваёй!
7 Хто ня будзе баяцца Цябе, Валадару народаў? Бо Табе належыць [гэта], бо паміж усіх
мудрацоў народаў і паміж усіх валадарстваў іхніх няма такога як Ты!
8 Усе яны дурныя і неразумныя, і пустое вучэньне іхняе, гэта [толькі] дрэва.
9 Срэбная бляха прывезена з Таршышу, і золата — з Уфазу, праца майстра і рук залатара.
Адзеньне іхняе з пурпуру і блакіту, усё яно — праца спраўных [майстроў].
10 А ГОСПАД — Бог праўдзівы. Ён — Бог жывы і Валадар вечны. Ад гневу Ягонага дрыжыць
зямля, і народы ня могуць устаяць перад гневам Ягоным.
11 Вось так кажыце ім: “Богі, якія не стварылі неба і зямлю, зьнікнуць з зямлі і з-пад неба
гэтага”.
12 Ён зрабіў зямлю моцай Сваёй, умацаваў сьвет мудрасьцю Сваёй, і розумам Сваім расьцягнуў
неба.
13 Калі голас Ягоны загучыць, шумяць воды ў небе. Ён узьнімае хмары ад краёў зямлі, Ён
выклікае маланкі і дождж і выводзіць вецер з камораў Сваіх.
14 Кожны чалавек бяз веданьня — дурны, будзе асаромлены кожны залатар, [які робіць] ідала,
бо тое, што зрабіў, падман, і няма духа ў іх.
15 Яны — марнота, праца, вартая сьмеху, у час наведваньня іхняга яны загінуць.
16 Не такая, як яны, частка Якуба, бо Ён —Той, Які ўкшталтаваў усё, а Ізраіль — племя спадчыны
Ягонай. ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае.
17 Пазьбірай з зямлі клункі твае, ты, што сядзіш у аблозе!
18 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Вось, Я гэтым разам выкіну далёка жыхароў зямлі гэтай, і прыцісну
іх, каб яны знайшлі [Мяне]”.
19 Гора мне дзеля няшчасьця майго, рана мая невылечная! А я казаў: “Гэта толькі хвароба
мая, і я вытрымаю яе”.
20 Намёт мой зьнішчаны, усе вяроўкі мае пазрываныя, сыны мае адыйшлі ад мяне і няма іх,
няма ўжо нікога, хто б расьцягнуў намёт мой і хто б павесіў заслоны мае.
21 Бо неразумныя [былі] пастыры і не зьвярталіся да ГОСПАДА, таму не пашанцавала ім, і ўвесь
статак іхні расьсеяўся.
22 Голас весткі: “Вось, лязгат вялікі ідзе з зямлі паўночнай, каб перамяніць гарады Юды ў
пустку, у лежышча цмокаў”.
23 Ведаю, ГОСПАДЗЕ, што не чалавек [вызначае] шлях свой, і ня ў [моцы] чалавека кіраваць
крокамі сваімі, калі ён ідзе.
24 Карай мяне, ГОСПАДЗЕ, але паводле правасудзьдзя, ня ў гневе Тваім, каб Ты ня зьнішчыў
мяне.
25 Вылі ярасьць Тваю на народы, якія ня ведаюць Цябе, і на плямёны, якія імя Твайго ня
клічуць, бо яны праглынулі Якуба і зжэрлі яго, і спустошылі сялібы ягоныя».

Яр 11

1 Слова, якое было да Ярэміі ад ГОСПАДА, кажучы:
2 «Паслухайце словы запавету гэтага і прамоўце іх да мужоў Юды і жыхароў Ерусаліму.
3 І ты скажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Пракляты чалавек, які ня слухае словаў
запавету гэтага,
4 якія Я загадаў бацькам вашым у дзень, у які вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, з печы жалезнай,
кажучы: "Слухайце голас Мой і рабіце ўсё так, як Я вам загадваю. І вы будзеце народам Маім,
а Я буду Богам вашым,
5 каб Я споўніў прысягу, якою прысягаў бацькам вашым, што дам ім зямлю, дзе цячэ малако і
мёд, якую [маеце] сёньня"”». А я адказаў і сказаў: «Амэн, ГОСПАДЗЕ!»
6 І сказаў ГОСПАД мне: «Абвясьці ўсе словы гэтыя ў гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму,
кажучы: “Слухайце словы запавету гэтага і выконвайце іх.

7 Бо просьбай прасіў Я бацькоў вашых ад дня, калі вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, аж да дня гэтага,
ад раніцы ўмольваў іх, кажучы: “Слухайце голас Мой!”
8 Але яны ня слухалі і не прыхілілі вуха сваё, і кожны хадзіў паводле закамянеласьці ліхога
сэрца свайго. І Я прывёў на іх усе словы запавету гэтага, якія Я загадаў, каб яны рабілі, а яны
не рабілі”».
9 І сказаў ГОСПАД мне: «Выяўлена змова сярод мужоў Юды і жыхароў Ерусаліму.
10 Яны вярнуліся да беззаконьня бацькоў сваіх даўнейшых, якія не хацелі слухаць словаў Маіх,
і яны пайшлі да багоў чужых, каб служыць ім. Дом Ізраіля і дом Юды зламалі запавет Мой, які
Я заключыў з бацькамі іхнімі.
11 Дзеля гэтага так кажа Госпад: “Я навяду на іх ліха, з якога яны ня змогуць выйсьці, і яны
будуць клікаць да Мяне, але Я ня выслухаю іх”.
12 І пойдуць гарады Юды і жыхары Ерусаліму, і будуць клікаць багоў, якім яны кадзілі, але яны
ня выратуюць іх у час бяды.
13 Бо паводле ліку гарадоў тваіх, Юда, былі богі твае, і паводле ліку вуліцаў у Ерусаліме вы
паставілі ахвярнікі на ганьбу, ахвярнікі, каб кадзіць Баалу.
14 А ты не маліся за народ гэты і не прынось за іх просьбы і малітвы, бо Я ня выслухаю іх у час,
калі яны будуць клікаць Мяне ў горы іхнім.
15 Навошта каханай Маёй у доме Маім зьдзяйсьняць намеры ліхія з многімі? Ці ж мяса
пасьвячонае ўхіліць ад цябе гора тваё і тады ты будзеш радавацца?
16 Зялёнай аліўкай з прыгожымі пладамі назваў ГОСПАД імя тваё. Але з гукам вялікага шуму
загарэўся над ёй агонь і былі паламаныя галіны ейныя.
17 І ГОСПАД Магуцьцяў, Які пасадзіў цябе, прадказаў табе бяду дзеля ліхоцьцяў дому Ізраіля і
дому Юды, якія рабілі яны, каб гнявіць Мяне, каб кадзіць Баалу.
18 І ГОСПАД даў даведацца мне, і я даведаўся, і тады Ты выявіў мне ўчынкі іхнія.
19 І я быў быццам ягнятка ціхае, якога вядуць на зарэз, і ня ведаў, што супраць мяне яны
задумалі думкі [ліхія]: “Зьнішчым дрэва з пладамі і сьсячэм яго з зямлі жывых. Няхай імя
ягонае ня ўзгадваецца болей”.
20 Але ГОСПАД Магуцьцяў судзіць праведна і даследуе ныркі і сэрца. Няхай я ўбачу помсту
Тваю над імі, бо Табе я выявіў справу маю.
21 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра людзей з Анатоту, якія шукаюць душу тваю, кажучы: “Не
прароч у імя ГОСПАДА, і не памрэш ад рукі нашай”.
22 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Вось, Я наведаю іх. Юнакі іхнія памруць ад мяча,
а сыны іхнія і дочкі іхнія памруць з голаду.
23 Ніхто з іх не застанецца, бо Я навяду ліха на людзей з Анатоту ў год наведваньня іхняга”.

Яр 12

1 Праведны Ты, ГОСПАДЗЕ, калі б я судзіўся з Табою. Аднак пра суд буду гаварыць з Табою.
Чаму шлях бязбожных мае посьпех і жывуць у супакоі ўсе крывадушнікі здрадлівыя?
2 Ты пасадзіў іх, і яны запускаюць карані, узрастаюць і даюць плады; блізкі Ты да вуснаў іхніх
і далёка ад нырак іхніх.
3 А Ты, ГОСПАДЗЕ, ведаеш мяне, бачыш мяне, і дасьледуеш сэрца маё, [што яно] з Табою.
Аддзялі іх, як авечкі на зарэз, і прызнач іх на дзень зьнішчэньня.
4 Як доўга будзе ў жалобе зямля, і трава на ўсякім полі будзе сохнуць? З-за ліхоты жыхароў
ейных пагінулі быдла і птушкі, бо яны казалі: “[Бог] ня бачыць канца [шляхоў] нашых”.
5 Калі ты бег з пешымі і змучыўся, як будзеш бегчы з коньнікамі? І калі ў краіне супакою ты
пачуваеш сябе бясьпечна, што ты будзеш рабіць у гушчары Ярдану?
6 Бо нават браты твае і дом бацькі твайго, нават яны будуць здраджваць табе і будуць крыкам
крычаць за табой, а ты ня вер ім, калі будуць прамаўляць да цябе прыхільна.
7 Я пакінуў дом Мой, пакінуў спадчыну Маю. Тое, што любіла душа Мая, Я аддаў у рукі ворагаў
Маіх.

8 Спадчына Мая сталася для Мяне, як леў у лесе; яна падняла супраць Мяне голас свой, таму Я
зьненавідзеў яе.
9 Ці ж спадчына Мая [сталася] для Мяне птушкай стракатай, над якою кружляюць птушкі
драпежныя? Прыходзьце, зьбярыцеся, усе зьвяры палявыя, сьпяшайцеся на жыраваньне.
10 Шматлікія пастухі разбурылі вінаграднік Мой, стапталі ўласнасьць Маю і зрабілі поле Маё
ўлюблёнае пустыняй бязьлюднай.
11 Ператварылі яе ў пустку, галосіць да Мяне пустэча; спустошана ўся зямля, бо няма нікога,
хто б узяў [гэта] да сэрца.
12 На ўсе ўзгоркі пустыні прыйшлі рабаўнікі, бо меч ГОСПАДА ўсё зьядае ад краю зямлі да краю
зямлі, і няма супакою ніводнаму целу.
13 Пасеялі пшаніцу, а сжалі церні, працавалі, але ня мелі карысьці. Вы асароміцеся дзеля
пладоў сваіх з прычыны палючага гневу ГОСПАДА!
14 Гэта кажа ГОСПАД супраць усіх ліхіх суседзяў Маіх, якія чэпяцца да спадчыны, якую Я
прызначыў народу Майму, Ізраілю: “Вось, Я вырву іх з зямлі іхняй, і дом Юды вырву спасярод
іх.
15 І станецца, калі яны будуць вырваныя, Я вярнуся і зьлітуюся над імі, і вярну іх, кожнага
чалавека ў спадчыну ягоную і ў зямлю ягоную.
16 І станецца, калі яны, навучыўшыся, навучацца шляхам народу Майго, каб прысягаць у імя
Маё: “Як жывы ГОСПАД!”, як яны навучылі народ Мой прысягаць Баалам, тады яны будуць
будавацца сярод народу Майго.
17 А калі не паслухаюць, тады Я вырву народ гэты, вырываючы і нішчачы, кажа ГОСПАД”».

Яр 13

1 Гэта сказаў мне ГОСПАД: «Ідзі і купі сабе пояс ільняны, і падпержы ім сьцёгны свае, але не
кладзі яго ў ваду».
2 І я купіў пояс паводле слова ГОСПАДА, і падперазаў сьцёгны мае.
3 І другі раз было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
4 «Вазьмі пояс, які ты купіў і які на сьцёгнах тваіх, устань і ідзі да Эўфрату, і схавай там яго ў
шчыліне скалы».
5 І я пайшоў, і схаваў яго каля Эўфрату, як загадаў мне ГОСПАД.
6 І сталася, калі скончылася шмат дзён, сказаў мне ГОСПАД: «Устань і ідзі да Эўфрату, і забяры
адтуль пояс, які Я загадаў табе схаваць».
7 І я пайшоў да Эўфрату, адшукаў і выцягнуў пояс з месца, у якім я схаваў яго, і вось, пояс
збутвеў і не надаваўся да нічога.
8 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
9 «Гэта кажа ГОСПАД. У такі спосаб Я зьнішчу пыхлівасьць Юды і пыхлівасьць вялікую
Ерусаліму.
10 Народ гэты ліхі ня хоча слухаць словаў Маіх і ходзіць у зацьвярдзеласьці сэрца свайго. Яны
пайшлі за багамі чужымі, каб служыць ім і пакланяцца ім. І станецца [з імі], як з гэтым поясам,
які ні на што не надаецца.
11 Бо як прылягае пояс да сьцёгнаў мужчыны, так Я прытуліў да Сябе ўвесь дом Ізраіля і ўвесь
дом Юды, кажа ГОСПАД, каб яны былі для Мяне народам, і імем, і хвалой, і аздобай, але яны
не паслухаліся.
12 І ты скажаш ім слова гэта: “Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Кожны збан напаўняецца віном”.
А яны скажуць табе: “Ці ж мы ведаючы, ня ведаем, што кожны збан напаўняецца віном?”
13 І скажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я напоўню п’янствам усіх жыхароў зямлі гэтай,
валадароў, якія сядзяць на пасадзе Давіда, сьвятароў, прарокаў і ўсіх жыхароў Ерусаліму,
14 і паразьбіваю іх адзін аб другога, бацькоў разам з сынамі, кажа ГОСПАД, не пашкадую і ня
зьлітуюся, аж пакуль ня зьнішчу іх”.
15 Слухайце і прыхіліце вуха, не вывышайцеся, бо ГОСПАД прамовіў.

16 Аддайце славу ГОСПАДУ, Богу вашаму, перш, чым прыйдзе цемра, і перш, чым спатыкнуцца
ногі вашыя ў гарах цёмных. І вы будзеце чакаць сьвятла, а Ён заменіць яго ў цемру сьмерці і
зробіць імглою.
17 А калі вы гэтага не паслухаеце, будзе плакаць таемна душа мая з прычыны пыхі вашай. І
плачучы, буду плакаць, і зальюцца сьлязьмі вочы мае, бо чарада ГОСПАДА ідзе ў няволю.
18 Скажыце валадару і [маці] валадара: “Сядаючы, сядзьце [нізка], бо ўпала з галавы вашай
карона славы вашай!”
19 Гарады Нэгеву замкнутыя, і няма таго, хто адчыніць іх. Увесь Юда пайшоў у няволю, у
няволю пайшоў цалкам.
20 Узьнімі вочы свае і паглядзі на тых, якія прыходзяць з поўначы. Дзе тая чарада, якая
даручана табе, авечкі славы тваёй?
21 Што ты скажаш, калі яны наведаюць цябе? Бо ты сама прывучыла іх быць над табою,
прыяцеляў на галаву [сваю]. Ці ж не ахопяць цябе болі, як жанчыну, што нараджае?
22 А калі ты скажаш у сэрцы тваім: “Чаму гэта ўсё напаткала мяне?” Дзеля мноства
беззаконьняў тваіх былі адкрытыя прыполы адзеньня твайго і аголены ногі твае.
23 Ці ж можа мурын зьмяніць скуру сваю, а леапард — плямы свае? Таксама і вы, ці можаце
рабіць добрае, калі вы навучаныя рабіць зло?
24 І Я рассыплю вас як мякіну, якую разносіць вецер пустыні.
25 Гэта доля твая, частка, якую Я адмерыў табе, кажа ГОСПАД, за тое, што ты забылася пра Мяне
і спадзявалася на хлусьню.
26 І Я ўзьніму прыполы адзеньня твайго аж на аблічча тваё, і будзе бачная ганьба твая,
27 чужалоствы твае і іржаньне тваё, бессаромнасьць распусты тваёй. На ўзгорках і на полі Я
бачыў брыдоты твае. Гора табе, Ерусалім, ня хочаш быць ачышчаны! Як доўга яшчэ [чакаць]?»

Яр 14

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Ярэміі ў справе засухі:
2 «Галосіць Юда, і брамы ягоныя саслабелі, хіляцца да зямлі, і ўзьнімаецца крык Ерусаліму.
3 Магнаты ягоныя пасылаюць слугаў сваіх па ваду; яны прыходзяць да сажалак і не знаходзяць
вады, вяртаюцца, пасудзіны іхнія пустыя, яны асаромленыя і зьбянтэжаныя, і закрываюць
галовы свае.
4 Ад таго, што глеба сьпечаная, бо не было дажджу на зямлі, саромеюцца земляробы,
закрываюць галовы свае.
5 Нават ланя нараджае ў полі і пакідае [малое], бо няма травы.
6 Дзікія аслы стаяць на ўзгорках, хапаюць паветра, як цмокі; вочы іхнія мутнеюць, бо няма
пашы.
7 Хоць беззаконьні нашыя сьведчаць супраць нас, ГОСПАДЗЕ, Ты ўчыні [з намі] дзеля імя
Твайго, бо павялічыліся адступніцтвы нашыя, мы саграшылі супраць Цябе.
8 Надзея Ізраіля, ГОСПАД, Збаўца ягоны ў часе трывогі! Чаму Ты быццам чужынец у зямлі і як
падарожнік, які расьцягвае [намёт], каб [толькі] пераночыць?
9 Чаму Ты быццам чалавек разгублены, як волат, які ня можа ратаваць? Ты ж сярод нас,
ГОСПАДЗЕ, і імя Тваё ў нас заклікаюць. Не пакідай нас!
10 Гэта кажа ГОСПАД народу гэтаму: “Яны любяць блукаць, ног сваіх не шкадуючы. Але
ГОСПАДУ не даспадобы гэта”. Цяпер Ён узгадаў беззаконьні іхнія і грахі іхнія карае».
11 І сказаў ГОСПАД мне: «Не прасі дабра для народу гэтага.
12 Калі яны будуць посьціць, Я ня выслухаю маленьняў іхніх; і калі яны будуць складаць
цэласпаленьні і ахвяры хлебныя, Я ня буду мець упадабаньня ў іх, але вынішчу іх мячом,
голадам і пошасьцю».
13 А я сказаў: «О, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, вось, прарокі кажуць ім: “Ня ўбачыце мяча, ня будзе ў
вас голаду, бо праўдзівы мір дам вам на месцы гэтым”».

14 І сказаў ГОСПАД мне: «Прарокі гэтыя хлусьню абвяшчаюць у імя Маё. Я не пасылаў іх, і
не загадваў ім, і не прамаўляў да іх. Відзежы хлусьлівыя, прадказаньні пустыя, мары сэрцаў
сваіх — вось што яны прарочаць вам.
15 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра прарокаў, якія прарочаць у імя Маё, але Я не пасылаў іх.
Яны кажуць: “Мяча і голаду ня будзе ў зямлі гэтай”. Ад мяча і голаду загінуць прарокі гэтыя,
16 а народ, якому яны прарочылі, будзе выкінуты на вуліцы Ерусаліму перад абліччам голаду
і мяча, і ніхто ня будзе хаваць іх, жонак іхніх, сыноў іхніх, дочак іхніх; і Я выльлю на іх
злачыннасьць іхнюю.
17 І ты скажаш ім слова гэтае: “Няхай вочы мае выліваюць сьлёзы ўначы і ўдзень, і няхай не
спыняюцца, бо біцьцём вялікім пабітая дзяўчына, дачка народу майго, ударам вельмі вялікім.
18 Калі я выйду ў поле, вось, забітыя мячом! Калі я пайду ў горад, вось, замучаныя голадам!
Нават прарок і сьвятар бадзяюцца па зямлі і нічога ня ведаюць”».
19 Ці адкінуўшы, адкінуў Ты Юду, або абрыдзіў Сыён душы Тваёй? Чаму Ты ўдарыў нас плягаю і
няма аздараўленьня? Мы чакалі міру, але няма [нічога] добрага; [чакалі] часу аздараўленьня,
і вось, трывога!
20 Прызнаем, ГОСПАДЗЕ, бязбожнасьць сваю, беззаконьні бацькоў нашых, бо саграшылі мы
супраць Цябе!
21 Не адкідай Ты [нас] дзеля імя Твайго! Не выстаўляй на ганьбу пасад славы Тваёй! Памятай,
не разрывай запавет Твой з намі!
22 Ці ёсьць сярод марных [багоў] паганскіх такія, што маглі спасылаць дождж? Ці неба [само]
дае залевы? Ці ж ня Ты, ГОСПАДЗЕ, Божа наш? У Табе мы маем надзею, бо Ты ўчыніў усё гэта.

Яр 15

1 І сказаў ГОСПАД мне: «Калі б [нават] Майсей і Самуэль сталі перад абліччам Маім, душа Мая
ня [зьвернецца] да народу гэтага! Выгані [іх] ад аблічча Майго, няхай яны адыйдуць!
2 І будзе, яны скажуць табе: “Куды мы пойдзем?” І ты адкажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД. Хто на
сьмерць, той [пойдзе] на сьмерць, хто пад меч, той пад меч, хто на голад, той на голад, хто ў
палон, той у палон.
3 І Я наведаю вас чатырма спосабамі, кажа ГОСПАД, мячом, каб забіваў, сабакамі, каб валачылі,
птушкамі нябеснымі і зьвярамі зямнымі, каб жэрлі і нішчылі.
4 І Я аддам іх на страхоцьце для ўсіх валадарстваў зямлі з-за Манасы, сына Эзэкіі, валадара
Юды, за тое, што ён учыніў у Ерусаліме”.
5 Бо хто мае літасьць над табою, Ерусаліме? Хто будзе спачуваць табе? Хто зьверне [з дарогі],
каб запытацца пра супакой у цябе?
6 Ты адкінуў Мяне, кажа ГОСПАД, павярнуўся плячыма. І Я выцягнуў руку Маю над табою і
зьнішчыў цябе. Я стаміўся шкадаваць [цябе]!
7 І Я разьвеяў іх веялкай у брамах зямлі, пазбавіў нашчадкаў, выгубіў народ Мой, але яны не
зьвярнулі са шляхоў сваіх.
8 Удоваў іхніх стала ў Мяне больш, чым пяску марскога. Я прывёў на іх, на маці юнакоў,
апоўдні нішчыцеля, паслаў на іх раптоўна трывогу і жах.
9 Самлела тая, якая сямёх нарадзіла, аддала душу сваю, зайшло сонца ейнае, калі яшчэ дзень
[быў], засаромілася і зьбянтэжылася. А рэшту іхнюю Я аддам пад меч перад абліччам ворагаў
іхніх, кажа ГОСПАД».
10 Гора мне, маці мая, што ты мяне нарадзіла, чалавека, які спрачаецца, і чалавека нязгоды
для ўсёй зямлі! Не пазычаю і не даю пазыкі, але ўсе мяне праклінаюць.
11 Сказаў ГОСПАД: «Я, вызваляючы, вызвалю цябе для дабра [твайго]. Я буду заступацца за
цябе ў час бяды і ў час уціску ад ворагаў.
12 Ці крышыцца жалезам жалеза з поўначы і медзь?
13 Багацьце тваё і скарбы твае Я аддам на рабунак бяз платы за ўсе грахі твае ў-ва ўсіх межах
тваіх.

14 І Я аддам цябе служыць ворагам тваім у зямлю, якой ня ведаеш, бо агонь загарэўся ў гневе
Маім і будзе гарэць над вамі».
15 Ты ведаеш [усё], ГОСПАДЗЕ, узгадай пра мяне і заступіся за мяне, і адпомсьці за мяне тым,
якія перасьледуюць мяне. У цярплівасьці гневу Твайго не забірай мяне, ведай, што дзеля Цябе
цярплю я зьнявагу.
16 Я знайшоў слова Тваё і праглынуў яго, і сталася слова Тваё для мяне пацяшэньнем і
радасьцю сэрца майго, бо заклікалася імя Тваё нада мною, ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў.
17 Не сядзеў я сярод насьмешнікаў і не весяліўся, а сядзеў я самотна перад абліччам рукі Тваёй,
бо Ты гневам напоўніў мяне.
18 Чаму боль мой безупынны, а рана мая невылечная, ня хоча загаіцца? Няўжо Ты станешся
для мяне як воды падманлівыя, [крыніца] няпэўная?
19 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: «Калі ты навернешся, Я вярну цябе, і ты станеш перад
абліччам Маім. І калі ты здабудзеш каштоўнае з нікчэмнага, ты будзеш як вусны Мае. Яны
самі зьвернуцца да цябе, а ты ня будзеш зьвяртацца да іх.
20 І Я зраблю цябе для народу гэтага моцным мурам мядзяным, і яны будуць ваяваць супраць
цябе, і не перамогуць цябе, бо Я з табою, каб збаўляць і ратаваць цябе, кажа ГОСПАД.
21 І Я выратую цябе з рук ліхотнікаў, і вызвалю цябе з рук гвалтаўнікоў».

Яр 16

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Ня бяры сабе жонкі, і няхай ня будзе ў цябе сыноў і дачок у месцы гэтым.
3 Бо гэта кажа ГОСПАД пра сыноў і дачок, якія будуць народжаныя ў месцы гэтым, і пра маці
іхніх, якія народзяць іх, і пра бацькоў іхніх, якія будуць даваць ім жыцьцё ў зямлі гэтай.
4 Ад сьмяротных хваробаў яны паўміраюць, ня будуць яны аплаканыя і ня будуць пахаваныя,
будуць гноем на абліччы зямлі. Будуць гінуць ад мяча і голаду, і трупы іхнія будуць ежай для
птушак нябесных і зьвяроў зямных.
5 Бо гэтак кажа ГОСПАД: “Не ўваходзь у дом смутку, і не ідзі на галашэньне, і не спачувай ім,
бо Я забраў ад народу гэтага супакой Мой, кажа ГОСПАД, міласэрнасьць і спагаднасьць.
6 Паўміраюць вялікія і малыя ў зямлі гэтай, ня будуць яны пахаваныя і ня будуць плакаць па
іх, ня будуць рабіць нарэзаў [на скуры] і ня будуць стрыгчыся [дзеля іх].
7 І ня будуць ламаць хлеб для іх у жалобе, каб пацешыць па памёршым, і не дадуць ім выпіць
з келіха пацяшэньня па бацьку іхнім і маці іхняй.
8 І не ўваходзь у дом банкетаваньня, каб сесьці з імі есьці і піць.
9 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я зраблю, што спыніцца на гэтым месцы,
на вачах вашых і ў дні вашыя голас вясёласьці і голас радасьці, голас жаніха і голас нявесты”.
10 І станецца, што ты абвесьціш народу гэтаму ўсе словы гэтыя, і скажуць табе: “Чаму ГОСПАД
прамовіў супраць нас пра ўсе гэтыя няшчасьці вялікія? І якое беззаконьне нашае, і які грэх
наш, якім мы саграшылі супраць ГОСПАДА, Бога нашага?”
11 І ты скажаш ім: “Бо пакінулі Мяне бацькі вашыя, кажа ГОСПАД, і пайшлі за іншымі багамі, і
служылі ім, і пакланяліся ім, а Мяне пакінулі, і Закон Мой не захоўвалі.
12 А вы яшчэ горш робіце, чым бацькі вашыя, і вось, кожны з вас ідзе паводле сапсутасьці сэрца
свайго ліхога, каб ня слухаць Мяне.
13 І Я выкіну вас з зямлі гэтай у зямлю, якой вы ня ведаеце, ані вы, ані бацькі вашыя, і вы
будзеце там служыць іншым багам удзень і ўначы, бо Я не зьяўлю для вас літасьці”.
14 Вось таму прыходзяць дні, кажа ГОСПАД, калі ўжо ня будуць казаць: “Як жывы ГОСПАД, Які
вывеў сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай”,
15 але толькі: “Як жывы ГОСПАД, Які вывеў сыноў Ізраіля з зямлі паўночнай і з усіх земляў, у
якія раскідаў іх”. І Я вярну іх у зямлю, якую даў бацькам іхнім.
16 Вось, Я пасылаю шмат рыбаловаў, кажа ГОСПАД, і будуць лавіць іх, а пасьля пашлю шмат
паляўнічых, і будуць паляваць на іх на ўсіх гарах, і на ўсіх узгорках, і ў-ва ўсіх шчылінах скалаў.

17 Бо вочы Мае — на ўсе шляхі іхнія, і яны не схаваныя перад абліччам Маім і не схаванае
беззаконьне іхняе перад вачыма Маімі.
18 І Я перш за ўсё аднагароджу ім падвойна за беззаконьне іхняе і за грэх іхні, за тое, што яны
апаганілі зямлю Маю трупамі брыдоты сваёй і агідай сваёй напоўнілі спадчыну Маю».
19 «ГОСПАДЗЕ, сіла мая і цьвярдыня мая, і прыстанішча маё ў дзень трывогі! Да Цябе прыйдуць
народы ад канцоў зямлі і скажуць: “Толькі хлусню і марнасьць атрымалі ў спадчыну бацькі
нашыя, і няма ад іх карысьці”.
20 Ці ж можа чалавек зрабіць сабе багоў? А яны — ня богі».
21 «Дзеля таго вось, Я дам пазнаць ім, гэтым разам дам пазнаць ім руку Маю і магутнасьць
Маю, і яны даведаюцца, што імя Маё — ГОСПАД!

Яр 17

1 Грэх Юды запісаны разцом жалезным, вастрыём дыямантавым высечаны на табліцы сэрцаў
іхніх і на рагах ахвярнікаў іхніх,
2 каб памяталі сыны іхнія пра ахвярнікі іхнія і пра астартаў іхніх каля дрэваў зялёных на
ўзгорках высокіх, на гары ў полі.
3 Багацьце тваё, усе скарбы твае Я аддам на рабунак, [зьнішчу] ўзвышшы твае за ўсе грахі твае
ў-ва ўсіх межах тваіх.
4 І ты згубіш спадчыну тваю, якую Я даў табе; і Я зраблю, што ты будзеш служыць у ворагаў
тваіх, у зямлі, якой ня ведаеш, бо вы распалілі агонь гневу Майго, і ён будзе гарэць вечна».
5 Гэта кажа ГОСПАД: «Пракляты чалавек, які спадзяецца на чалавека і які цела робіць рамяном
[сваім], а ад ГОСПАДА адварочваецца сэрца ягонае!
6 І ён будзе як хмызьняк у стэпе, і ня ўбачыць ён, калі прыходзіць добрае. Ён будзе жыць у
месцы сухім у пустыні, на зямлі салёнай і бязьлюднай.
7 Дабраслаўлёны чалавек, які спадзяецца на ГОСПАДА, і ГОСПАД — надзея ягоная!
8 І ён як дрэва, якое пасаджана над вадою і да струмянёў пускае карані свае, і ня будзе бачыць
яно, калі прыйдзе спякота, і лісьце ягонае будзе зялёным, і ў год засухі ня будзе журыцца, і не
перастане даваць плады.
9 Сэрца [чалавека] больш здрадлівае, чым усё [астатняе], і невылечнае; хто спазнае яго?
10 Я, ГОСПАД, дасьледую сэрца і выпрабоўваю ныркі, каб аднагародзіць кожнаму паводле
шляхоў ягоных і паводле пладоў учынкаў ягоных.
11 Курапатка выседжвае [яйкі], якіх ня зьнесла, і [такі самы] той, хто набывае багацьце
няпраўдаю. У сярэдзіне дзён сваіх ён пакіне яго, і пры канцы сваім станецца дурнем».
12 «Пасад славы, узвышаны спрадвеку — гэта месца сьвятыні нашай!
13 Надзея Ізраіля, ГОСПАДЗЕ! Усе, якія пакідаюць Цябе, будуць асаромленыя. Тыя, якія
адварочваюцца ад Цябе, будуць запісаныя на зямлі, бо яны пакінулі ГОСПАДА, крыніцу вады
жывой.
14 Аздараві мяне, ГОСПАДЗЕ, і буду аздароўлены! Збаў мяне, і буду збаўлены! Бо Ты — хвала
мая!
15 Вось, яны кажуць мне: “Дзе слова ГОСПАДА? Няхай яно прыйдзе”.
16 Але я не ўцякаў, каб быць пастырам у Цябе і ня прагнуў дня зьнішчэньня. Ты ведаеш, тое,
што выходзіла з вуснаў маіх, было перад абліччам Тваім.
17 Ня будзь для мяне жахам, Ты — прыбежышча маё ў дзень няшчасьця!
18 Няхай будуць асаромленыя тыя, якія перасьледуюць мяне, а я няхай ня буду асаромлены.
Няхай яны будуць зьбянтэжаны, а я няхай ня буду зьбянтэжаны. Спашлі на іх дзень ліхі, і
падвойным ударам удар іх».
19 Гэта сказаў мне ГОСПАД: «Ідзі і стань у браме сыноў народу, праз якую ўваходзяць валадары
Юды і праз якую выходзяць, і ў-ва ўсіх брамах Ерусаліму,
20 і кажы ім: “Слухайце слова ГОСПАДА, валадары Юды, і ўвесь Юда, і ўсе жыхары Ерусаліму,
якія ўваходзяць праз брамы гэтыя.

21 Гэта кажа ГОСПАД. Сьцеражыцеся, каб [захаваць] душы вашыя, і не насіце цяжараў у дзень
суботы, і ня ўносьце іх праз брамы Ерусаліму.
22 І не выносьце цяжараў з дамоў вашых у дзень суботы, і не рабіце ніякай работы, але
сьвяткуйце дзень суботы, як Я загадаў бацькам вашым”.
23 Але яны ня слухалі, і не прыхілілі вуха сваё, але зрабілі цьвёрдым карак свой, каб ня слухаць
і не прыняць настаўленьня.
24 І станецца, калі, слухаючы, будзеце слухаць Мяне, кажа ГОСПАД, і ня будзеце ўносіць
цяжараў праз брамы гораду гэтага ў дзень суботы, і будзеце сьвяткаваць дзень суботы, і ня
будзеце рабіць у гэты [дзень] аніякае работы,
25 будуць уваходзіць праз брамы гораду гэтага валадары і князі, якія сядзяць на пасадзе Давіда,
будуць езьдзіць на калясьніцах і конях яны, князі іхнія, мужы Юды і жыхары Ерусаліму, а горад
гэты будзе абжыты на вякі.
26 І будуць прыходзіць з гарадоў Юды і з ваколіцаў Ерусаліму, з зямлі Бэн’яміна, з Шэфэлі, з гор
і з Нэгеву, прыносячы цэласпаленьні і ахвяры, ахвяры хлебныя і кадзіла і прыносячы ахвяры
падзякі ў Дом ГОСПАДА.
27 А калі ня будзеце слухаць Мяне, каб сьвяткаваць дзень суботы, і не насіць цяжараў,
уваходзячы праз брамы Ерусаліму ў дзень суботы, Я запалю агонь у брамах ягоных, і ён
праглыне палацы Ерусаліму, і ня згасне».

Яр 18

1 Слова, якое было ад ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
2 «Устань і зыйдзі ў дом ганчара, і там пачуеш слова Маё».
3 І я зыйшоў у дом ганчара, і вось, ён акурат працаваў пры кружале.
4 І папсулася пасудзіна, якую ён рабіў з гліны, у руцэ ганчара, і ён зноў зьвярнуўся [да яе], і
зрабіў з яе іншую пасудзіну, якая даспадобы была ў вачах ганчара, каб ён зрабіў яе.
5 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
6 «Ці не магу Я зрабіць з вамі, дом Ізраіля, як гэты ганчар? — кажа ГОСПАД. Вось, як гліна ў
руцэ ганчара, так вы, дом Ізраіля, у руцэ Маёй.
7 Часам Я прамоўлю адносна народу і валадарства, што Я выкарчую і павалю, і зьнішчу яго.
8 Але калі народ гэты, супраць якога Я прамаўляў, адвернецца ад ліхоты сваёй, Я пашкадую
[ўчыніць] зло, якое Я задумаў учыніць для яго.
9 Іншым разам Я прамоўлю адносна народу і валадарства, што збудую і ўгрунтую [яго].
10 Але калі ён будзе рабіць ліхоту ў вачах Маіх, ня слухаючы голас Мой, Я пашкадую [ўчыніць]
дабро, якое казаў, што зраблю для яго.
11 І цяпер кажы, прашу, мужам Юды і жыхарам Ерусаліму, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД. Вось,
Я рыхтую супраць вас зло і задумаў супраць вас намер. Навярніцеся, прашу, кожны ад шляху
свайго ліхога і зрабіце добрымі шляхі вашыя і ўчынкі вашыя”.
12 А яны сказалі: “Надарма! Бо мы будзем хадзіць паводле думак нашых, кожны будзе рабіць
паводле закамянеласьці ліхога сэрца свайго”.
13 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: “Спытайцеся, прашу, у народаў, ці хто чуў пра такое?
Агідную [рэч] учыніла дзяўчына Ізраіля.
14 Ці зыходзіць сьнег Лібану са скалы ў полі? Ці высыхаюць воды чужыя, халодныя і плыткія?
15 Бо народ Мой забыўся пра Мяне, для марноты яны паляць кадзіла! І будуць яны спатыкацца
на шляхах сваіх, на сьцежках старадаўніх, будуць хадзіць па сьцежках, па дарозе няходжанай.
16 І пераменіцца зямля іхняя ў пустэчу, [будзе] пасьмешышчам на вякі. Кожны, хто будзе
праходзіць, аслупянее і будзе ківаць галавою сваёй.
17 Як вецер усходні, Я раскідаю іх перад абліччам ворага. Патыліцу, а не аблічча Я пакажу ім у
дзень зьнішчэньня іхняга”».
18 І яны сказалі: «Хадземце і змовімся супраць Ярэміі, бо ня зьнік Закон у сьвятара, і рада ў
мудраца, і слова ў прарока. Хадземце, ударым яго языком, і не зьвяртайма ўвагі на ўсе словы
ягоныя».

19 Паслухай мяне, ГОСПАДЗЕ, і пачуй голас супраціўнікаў маіх.
20 Ці ж за дабро аднагароджваюць ліхам? Бо яны выкапалі яму для душы маёй! Узгадай, як я
стаяў перад абліччам Тваім, каб прамаўляць пра іх добрае і каб адвярнуць гнеў Твой ад іх.
21 Дзеля гэтага аддай сыноў іхніх на голад і вылі [кроў] іхнюю ад вострыва мяча! Няхай жонкі
іхнія стануць бязьдзетнымі ўдовамі, а мужы іхнія няхай будуць сьмерцю забітыя, юнакі іхнія
няхай будуць пазасяканыя мячом на вайне.
22 Няхай чуецца крык у дамах іхніх, бо Ты навядзеш на іх раптоўна арду злачынцаў, бо яны
выкапалі яму, каб схапіць мяне, і пад ногі мае пасткі паставілі.
23 А Ты, ГОСПАДЗЕ, ведаеш усе намеры іхнія, каб забіць мяне. Не даруй ім беззаконьня іхняга
і грэху іхняга не прымай ад аблічча Твайго. Няхай яны спатыкнуцца перад абліччам Тваім.

Яр 19

1 Гэта сказаў ГОСПАД: «Ідзі і купі ў ганчара збан гліняны, і [вазьмі] старшыняў народу і
старшыняў сьвятароў.
2 І выйдзі ў даліну Бэн-Гінном, якая пры ўваходзе ў браму Харсіт, і там будзеш абвяшчаць
слова, якое Я прамоўлю табе.
3 І скажаш: “Слухайце слова ГОСПАДА, валадары Юды і жыхары Ерусаліму! Гэта кажа ГОСПАД
Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я навяду няшчасьце на месца гэтае, так што ў кожнага, хто гэта
чуе, зашуміць у вушах ягоных,
4 за тое, што вы пакінулі мяне і апаганілі месца гэтае, і кадзілі іншым багам, якіх ня ведалі ані
вы, ані бацькі вашыя, ані валадары Юды, і вы напоўнілі месца гэтае крывёю нявінных,
5 і пабудавалі вышыні Баалу, каб паліць там сыноў сваіх у агні цэласпаленьняў для Баала, чаго
Я не загадваў і не гаварыў, і гэта не прыходзіла ў сэрца Маё.
6 Дзеля гэтага, вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і больш ня будзе называцца месца гэтае
Тафэт і даліна Бэн-Гінном, але [назавецца] Даліна забойства.
7 І Я зьнішчу раду Юды і Ерусаліму на месцы гэтым, і яны ўпадуць ад мяча перад абліччам
ворагаў іхніх і ад рукі тых, якія шукаюць душы іхняй. І Я дам целы іхнія на жыраваньне
птушкам нябесным і зьвярам зямным,
8 і зраблю народ гэты пустэчаю і насьмешкаю. Кожны, хто будзе паўз яго праходзіць,
аслупянее і засьвішча дзеля ўсіх ранаў ягоных.
9 І Я зраблю, што яны будуць есьці целы сыноў сваіх і целы дочак сваіх, і кожны будзе есьці
цела бліжняга свайго ў аблозе і прыгнёце, якім будуць прыгнятаць іх ворагі іхнія, і тыя, якія
шукаюць душу іхнюю”.
10 І ты разьбі збан перад вачыма мужчынаў, якія пойдуць з табой,
11 і скажы ім: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Я гэтак разаб’ю народ гэты і горад гэты, як
разьбіваецца посуд ганчара, які ня можа ўжо быць напраўлены. Будуць хаваць у Тафэце, таму
што ня будзе месца на пахаваньне.
12 Я так зраблю месцу гэтаму, кажа ГОСПАД, і жыхарам ягоным, што горад гэты будзе такім,
як Тафэт.
13 І стануцца дамы Ерусаліму і дамы валадароў Юды нячыстымі, як месца Тафэт, усе дамы, на
дахах якіх палілі кадзіла для моцаў нябесных і складалі ахвяры вадкія для іншых багоў”».
14 І прыйшоў Ярэмія з Тафэту, куды яго паслаў ГОСПАД прарочыць, і стаў на панадворку Дома
ГОСПАДА, кажучы ўсяму народу:
15 «Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я навяду на горад гэты і на ўсе паселішчы
ўсялякія беды, якія прамаўляў супраць іх, бо яны зрабілі цьвёрдым карак свой, каб ня слухаць
словаў Маіх».

Яр 20

1 І пачуў Пашхур, сын Імэра, сьвятар, які быў начальнікам і наглядчыкам над Домам ГОСПАДА,
Ярэмію, які прарочыў словы гэтыя.

2 І загадаў Пашхур біць прарока Ярэмію і закуць яго ў калоду, якая [была] ў верхняй браме
Бэн'яміна, у Доме ГОСПАДА.
3 І сталася назаўтра, што вызваліў Пашхур Ярэмію з калоды. І сказаў яму Ярэмія: «Не Пашхур
называе цябе ГОСПАД, але Магор-Місавіў.
4 Бо гэта кажа ГОСПАД: "Вось, Я зраблю цябе страхоцьцем для цябе і для ўсіх, хто любіць цябе.
Яны ўпадуць ад мяча ворагаў сваіх, а вочы твае будуць глядзець на гэта! Усяго Юду Я выдам у
рукі валадара Бабілону, і ён павядзе іх у няволю ў Бабілон, і будзе забіваць іх мячом.
5 І Я аддам усе багацьці гораду гэтага, увесь набытак ягоны і ўсе каштоўнасьці ягоныя, і ўсе
скарбы валадароў Юды Я аддам у рукі ворагаў іхніх, каб іх зрабавалі, і забралі, і вывезьлі ў
Бабілон.
6 А ты, Пашхур, і ўсе хатнія дому твайго пойдзеце ў палон. І ты пойдзеш у Бабілон, і там
памрэш, і будзеш пахаваны ты і ўсе, хто любіць цябе, якім ты прарочыў фальшыва"».
7 «Ты зьвёў мяне, ГОСПАДЗЕ, і я быў зьведзены, Ты дужэйшы [за мяне] і перамог мяне, я стаўся
пасьмешышчам увесь дзень, усе зьдзекуюцца з мяне.
8 Бо колькі разоў прамаўляю, крычу і клічу: "Гвалт і зьнішчэньне". І слова ГОСПАДА сталася
для мяне зьнявагай і насьмешкай увесь дзень.
9 І я сказаў: "Ня буду ўзгадваць Яго, і ня буду больш прамаўляць у імя Ягонае!" І стаўся ў сэрцы
маім нібы агонь, які палае, што замкнуты ў костках маіх, і я змучыўся трымаць яго, і ня мог.
10 Я чуў абмовы ад многіх: "Жах навокал! Паведаміце, і мы паведамім пра яго!" Усе людзі,
якія ў міры са мною, чакаюць падзеньня майго: "Можа, ён будзе падмануты і мы пераможам
яго, і адпомсьцім яму".
11 Але ГОСПАД са мною як волат магутны; таму тыя, што перасьледуюць мяне, спатыкнуцца
і не перамогуць, моцна асаромяцца, бо не даб'юцца посьпеху, [атрымаюць] ганьбу вечную,
якая не забудзецца.
12 А Ты, ГОСПАД Магуцьцяў, выспрабоўваеш праведніка і бачыш ныркі і сэрца. Няхай я ўбачу
помсту Тваю над імі, бо Табе адкрыў я справу маю.
13 Сьпявайце ГОСПАДУ, хваліце ГОСПАДА, бо Ён збавіў душу беднага з рукі злачынцаў.
14 Пракляты той дзень, у якім я нарадзіўся, дзень, у якім нарадзіла мяне маці мая, няхай ня
будзе ён дабраслаўлёны.
15 Пракляты той чалавек, які паведаміў бацьку майму, кажучы: "Нарадзіўся ў цябе сын,
хлопец", і радасьцю ўзрадаваў яго.
16 Няхай будзе той чалавек як гарады, якія зьнішчыў ГОСПАД і не пашкадаваў! Няхай чуе ён
крык раніцай і гармідар [ваенны] апоўдні,
17 за тое, што не забіў мяне ва ўлоньні [маці], каб сталася для мяне маці мая магілай маёй, а
ўлоньне ейнае было цяжарным вечна.
18 Навошта я выйшаў з улоньня [маці]? Каб бачыць гора і смутак, і скончыць дні мае ў ганьбе?»

Яр 21

1 Слова, якое было да Ярэміі ад ГОСПАДА, калі валадар Сэдэкія паслаў да яго Пашхура, сына
Малькія, і сьвятара Сафонію, сына Маасэі, кажучы:
2 «Парайся, просім, у імя нашае ў ГОСПАДА, бо Навухаданосар, валадар Бабілону, ваюе супраць
нас. Можа, ГОСПАД учыніць для нас цуды Свае, і ён адступіць ад нас».
3 І сказаў ім Ярэмія: «Так адкажыце Сэдэкіі:
4 "Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Вось, Я адвярну назад прылады ваенныя, якія ў руках вашых
і якімі вы ваюеце з валадаром Бабілонскім і з Халдэйцамі, што аблягаюць вас звонку муроў, і
зьбяру іх у сярэдзіне гораду гэтага.
5 І Я буду ваяваць супраць вас рукою ўзьнятаю і рамяном дужым, з гневам, ярасьцю і
абурэньнем вялікім.
6 І Я ўдару жыхароў гораду гэтага, і чалавека, і жывёлу; паўміраюць яны ад пошасьці вялікай.
7 А пасьля гэтага, кажа ГОСПАД, Я выдам Сэдэкію, валадара Юды, слугаў ягоных і народ, і
тых, хто застанецца ў горадзе гэтым пасьля заразы, мяча і голаду, у рукі Навухаданосара,

валадара Бабілонскага, і ў рукі ворагаў іхніх, і ў рукі тых, якія шукаюць душы іхняй, і ён заб'е іх вострывам мяча, і не памілуе іх, і ня будзе шкадаваць іх, і ня будзе мець літасьці".
8 А народу гэтаму скажы: "Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я стаўлю перад абліччам вашым шлях жыцьця і шлях сьмерці.
9 Хто застанецца ў горадзе гэтым, памрэ ад мяча, голаду і пошасьці. А хто выйдзе і патрапіць да Халдэйцаў, якія аблягаюць вас, будзе жыць і атрымае, як здабычу, душу сваю.
10 Бо Я зьвярнуў аблічча Маё на горад гэты на злое, а не на добрае, кажа ГОСПАД. Ён будзе выдадзены ў рукі валадара Бабілонскага, і той спаліць яго агнём".
11 Адносна дому валадара Юды слухайце слова ГОСПАДА:
12 "Доме Давіда, гэта кажа ГОСПАД. Судзіце справядліва ад раніцы і вызваляйце прыгнечанага з рукі крыўдзіцеля! Бо інакш гнеў Мой разгарыцца як агонь, і будзе гарэць, і ніхто ня зможа патушыць яго з прычыны ліхіх учынкаў вашых.
13 Вось, Я супраць цябе, жыхарка даліны, скала на раўніне, кажа ГОСПАД. Вы гаворыце: "Хто прыйдзе на нас, і хто ўвойдзе ў памяшканьні нашыя?"
14 Я пакараю вас паводле пладоў учынкаў вашых, кажа ГОСПАД, і запалю агонь у лесе ягоным, і ён праглыне ўсё вакол яго"».

Яр 22

1 «Гэта кажа ГОСПАД. Зыйдзі ў дом валадара Юды і прамоў там слова гэтае.
2 І скажаш: "Слухай слова ГОСПАДА, ты, валадар Юды, які сядзіш на пасадзе Давіда, ты, і слугі твае, і народ твой, які ўваходзіць у брамы гэтыя.
3 Гэта кажа ГОСПАД. Чыніце суд і праведнасьць, вызваляйце прыгнечанага з рукі крыўдзіцеля, і чужынца, сірату і ўдаву не прыгнятайце. Не рабіце гвалту і крыві нявіннай не пралівайце ў месцы гэтым.
4 Бо калі вы, выконваючы, выканаеце слова гэтае, будуць уваходзіць у брамы дому гэтага валадары, якія сядзяць на пасадзе Давіда і ўяжджаюць на калясьніцах і конях, яны, слугі іхнія і народ іхні.
5 А калі ня будзеце слухаць словаў гэтых, прысягаю на Сябе Самога, кажа ГОСПАД, дом гэты станецца руінай.
6 Бо гэта кажа ГОСПАД пра дом валадара Юды: "Ты для Мяне як Гілеад, вяршыня Лібану. Але Я зраблю з цябе пустыню, горад бязьлюдны.
7 Я падрыхтую супраць цябе нішчыцеляў, кожнага са зброяй ягонай, і яны зрэжуць найлепшыя кедры твае і кінуць у агонь".
8 І будуць праходзіць шмат народаў праз горад гэты, і скажа кожны бліжняму свайму: "Чаму зрабіў так ГОСПАД гораду гэтаму вялікаму?"
9 І адкажуць: "За тое, што яны пакінулі запавет ГОСПАДА, Бога свайго, і пакланяліся іншым багам, і служылі ім".
10 Ня плачце дзеля памёршага і не галасіце дзеля яго. Плачце, плачучы, дзеля таго, хто адыходзіць, бо ён ня вернецца ўжо і ня ўбачыць родную зямлю сваю.
11 Бо гэта кажа ГОСПАД пра Шальлюма, сына Ёсіі, валадара Юды, які заваладарыў пасьля Ёсіі, бацькі свайго і які выйшаў з месца гэтага: "Ён ня вернецца больш сюды.
12 Бо ў месцы, у якое завялі яго, там ён памрэ, і зямлі гэтай больш ня ўбачыць"".
13 Гора таму, хто будуе дом свой на няправеднасьці, і сьвятліцы свае — на судзе несправядлівым, бліжняму свайму кажа працаваць задарма, і заробку ягонага не аддае яму.
14 Ён кажа: "Пабудую сабе дом прасторны і сьвятліцы шырокія", і высякае вокны сабе, і ашалёўвае [дрэвам] кедровым, і малюе [фарбай] чырвонай.
15 Ці ты будзеш валадарыць, таму што жывеш у [доме] кедровым? Ці ж бацька твой ня еў і ня піў? Але ён чыніў суд і праведнасьць, і добра было яму.
16 Ён разьбіраў справу ўбогага і беднага, і добра было яму тады. Ці ж ня гэта [значыць] ведаць Мяне? — кажа ГОСПАД.

17 А вочы твае і сэрца тваё [прагнуць] толькі карысьці тваёй, каб праліваць кроў нявінную, каб
чыніць крыўды і гвалты.
18 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды: “Ня будуць галасіць
па ім: “Аёй, браце мой! Аёй, сястра мая!” Ня будуць галасіць па ім: “Аёй, пане! Аёй,
яснавяльможны!”
19 Будзе ён пахаваны, як хаваюць асла. Выцягнуць яго і кінуць па-за брамамі Ерусаліму”.
20 Узыйдзі на Лібан і крычы, і на Башане ўзьнімі голас твой, і гукай з Абарыму, бо зьнішчаны
ўсе, якія любілі цябе.
21 Я прамаўляў да цябе ў [час] бясьпекі тваёй, а ты адказаў: “Ня буду слухаць!” Гэта шлях твой
ад юнацтва твайго, што ты ня слухаўся голасу Майго.
22 Усіх пастыраў тваіх будзе пасьвіць вецер, а тыя, што любілі цябе, пойдуць у няволю. Вось
тады ты засаромішся і пачырванееш з прычыны ўсёй ліхоты тваёй.
23 Ты, што жывеш на Лібане і маеш гняздо на кедрах, як ты будзеш стагнаць, калі прыйдуць на
цябе болі, як болі той, якая нараджае.
24 Як жывы Я, кажа ГОСПАД, калі б Ехонія, сын Егаякіма, валадар Юды, быў пярсьцёнкам на
правай руцэ Маёй, нават адтуль Я сарву яго!
25 Я аддам цябе ў рукі тых, якія шукаюць душы тваёй, і ў рукі тых, абліччаў якіх ты баішся, у
рукі Навухаданосара, валадара Бабілонскага, і ў рукі Халдэйцаў.
26 І Я выкіну цябе і маці тваю, якая нарадзіла цябе, у зямлю чужую, у якой вы не нарадзіліся, і
там вы памрацё,
27 і ў зямлю, у якую прагнеце душою сваёй, каб вярнуцца, ня вернецеся.
28 Ці ж чалавек той, Ехонія, — [гэта] пасудзіна пагарджаная і пабітая? Ці ж ён — рэч, у якой ня
маюць упадабаньня? Чаму адкінуты ён і насеньне ягонае, і выкінутыя ў зямлю, якой яны ня
ведаюць?
29 Зямля, зямля, зямля! Слухай слова ГОСПАДА!
30 Гэта кажа ГОСПАД: “Запішыце чалавека гэтага як мужчыну, пазбаўленага патомства, якому
няма шчасьця ў днях ягоных, бо ня будзе мець шчасьця ніхто з насеньня ягонага, каб сядзець
на пасадзе Давіда і панаваць у Юдзе”».

Яр 23

1 «Гора пастырам, якія губяць і разганяюць авечак статку Майго, кажа ГОСПАД.
2 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля пра пастыраў, якія пасьвяць народ Мой: “Вы
расьцярушылі авечак Маіх, і разагналі іх, і ня рупіліся пра іх. Вось, Я наведаю вас за ліхоту
ўчынкаў вашых, кажа ГОСПАД.
3 І Я зьбяру рэшту авечак Маіх з усіх земляў, у якія Я выгнаў іх, і вярну іх на пашы іхнія, і будуць
яны расьці, і памножацца.
4 І Я пастаўлю над імі пастыраў, і яны будуць пасьвіць іх; і ня будуць яны больш палохацца і
баяцца, і ня будуць загубленыя, кажа ГОСПАД.
5 Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я вырашчу Давіду Парастак праведны, і будзе
валадарыць Валадар, і Ён будзе справядлівы, і Ён будзе чыніць суд і праведнасьць на зямлі.
6 У дні Ягоныя будзе збаўлены Юда, і Ізраіль будзе жыць бясьпечна. А гэта імя Ягонае, якім
назавуць Яго: "ГОСПАД — праведнасьць нашая".
7 Дзеля гэтага вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і ня будуць больш казаць: "Як жывы
ГОСПАД, Які вывеў сыноў Ізраіля з зямлі Эгіпецкай!",
8 але: "Як жывы ГОСПАД, Які вывеў і прывёў насеньне дому Ізраіля з зямлі паўночнай і з усіх
земляў, у якія выгнаў іх, і будуць яны жыць у зямлі сваёй"”».
9 Пра прарокаў. «Разрываецца сэрца маё ў нутры маім, дрыжаць усе косткі мае. Я стаўся, як
п’яны, як муж, які перапоўнены віном з прычыны ГОСПАДА і сьвятых словаў Ягоных.
10 Бо зямля напоўнена чужаложнікамі, бо з прычыны праклёну ў жалобе ўся зямля, высахлі
пашы ў пустыні, і хада іхняя сталася ліхой, і сіла іхняя — у няправасьці.
11 Бо і прарок, і сьвятар сапсаваныя, і нават у Доме Маім знайшоў Я ліхоту іхнюю, кажа ГОСПАД.

12 Дзеля гэтага шлях іхні будзе сьлізкі для іх, у цемры будуць спатыкацца і ўпадуць, бо Я
прывяду на іх ліха ў год наведваньня іхняга, кажа ГОСПАД.
13 І сярод прарокаў Самарыі Я бачыў бязглуздасьць, яны прарочылі ў [імя] Баала і падманвалі
народ Мой, Ізраіля.
14 І ў прарокаў Ерусаліму Я бачыў брыдоту, чужалоства і хаджэньне ў хлусьні, яны
ўмацоўваюць рукі злачынцаў, каб ніхто не навярнуўся ад ліхоты сваёй. Сталіся яны ўсе для
Мяне, як Садом, і жыхары ягоныя, як Гамора.
15 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў пра прарокаў гэтых: “Вось, Я накармлю іх
палыном і напаю іх вадою атрутнаю, бо ад прарокаў Ерусалімскіх выйшла бязбожнасьць на
ўсю зямлю гэтую”.
16 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Ня слухайце словаў прарокаў, якія прарочаць вам. Яны
зводзяць вас; прамаўляюць прыдумкі сэрца свайго, а ня [слова] з вуснаў ГОСПАДА.
17 Яны, кажучы, кажуць тым, якія абражаюць Мяне: “Прамовіў ГОСПАД. Будзе мір вам”. І
кожнаму, хто ходзіць у зацьвярдзеласьці сэрца свайго, кажуць: “Ня прыйдзе да вас зло”.
18 Бо хто стаяў на нарадзе ў ГОСПАДА, і бачыў, і чуў словы Ягоныя? Хто прыслухоўваўся да
слова Ягонага і пачуў?
19 Вось, бура ад ГОСПАДА, лютасьць выходзіць, і віхор шалее і спадае на галаву бязбожнікаў.
20 Ня вернецца гнеў ГОСПАДА, пакуль Ён ня зьдзейсьніць і пакуль ня выканае намераў сэрца
Свайго. У апошнія дні зразумееце гэта ў поўні.
21 Я не пасылаў прарокаў гэтых, а яны [самі] пабеглі. Я не прамаўляў да іх, а яны прарочаць.
22 Калі б яны стаялі на нарадзе Маёй, яны б абвесьцілі словы Мае народу Майму і адвярнулі б
іх ад ліхога шляху іхняга і ад ліхоты ўчынкаў іхніх.
23 Ці ж Я — Бог, [калі Я] блізка, кажа ГОСПАД, а ня Бог, [калі Я] далёка?
24 Калі чалавек схаваецца ў схове, ці ж Я ня ўбачу яго? — кажа ГОСПАД. Ці ж Я не напаўняю
неба і зямлю? — кажа ГОСПАД.
25 Я чуў, што кажуць прарокі, прарочачы ў імя Маё хлусьню і кажучы: “Меў я сон, меў я сон”.
26 Як доўга будзе [гэта] ў сэрцы прарокаў, якія прарочаць хлусьню і праракуюць прыдумкі
сэрца свайго?
27 Яны задумалі зрабіць, каб праз сны іхнія, якія яны распавядаюць адзін аднаму, народ Мой
забыўся на імя Маё, як забыліся бацькі іхнія на імя Маё з прычыны Баала.
28 Прарок, які мае сон, няхай распавядае сон, а хто мае слова Маё, той няхай абвяшчае слова
Маё праўдзіва! Што [мае] салома з зернем? — кажа ГОСПАД.
29 Ці ж словы Мае ня ёсьць, як агонь, кажа ГОСПАД, і быццам молат, які крышыць скалу?
30 Дзеля гэтага Я — супраць прарокаў, кажа ГОСПАД, якія крадуць адзін у аднаго слова Маё.
31 Вось, Я — супраць прарокаў, кажа ГОСПАД, якія карыстаюцца языком сваім і прарочаць, нібы
кажа [Бог].
32 Вось, Я — супраць прарокаў са снамі фальшывымі, кажа ГОСПАД, яны распавядаюць іх і
падманваюць народ Мой хлусьнёй сваёй і махлярствам сваім. Я не пасылаў іх і не загадваў
ім; і няма ад іх карысьці для народу гэтага, кажа ГОСПАД.
33 Калі народ гэты, або прарокі, або сьвятар спытаюцца ў цябе, кажучы: “Які цяжар ад
ГОСПАДА?”, адкажаш ім: “Вы — цяжар, і Я адкінуў вас, кажа ГОСПАД”.
34 І прарока, і сьвятара, і народ гэты, які кажа: “Цяжар ад ГОСПАДА”, Я пакараю, і яго самога, і
дом ягоны.
35 Гэта будзе казаць кожны бліжняму свайму і кожны брату свайму: “Што адказаў ГОСПАД?”,
або: “Што прамовіў ГОСПАД?”
36 І ня ўзгадвайце больш пра “цяжар ад ГОСПАДА”, бо [таму, хто кажа так,] станецца цяжарам
кожнае слова ягонае, бо вы перакруцілі словы Бога жывога, ГОСПАДА Магуцьцяў, Бога нашага.
37 Гэтак скажаш прароку: “Што адказаў табе ГОСПАД?”, і: “Што прамовіў ГОСПАД?”
38 А калі вы скажаце “Цяжар ад ГОСПАДА”, тады гэта кажа ГОСПАД: “За тое, што вы кажаце
слова гэтае “Цяжар ад ГОСПАДА”, а Я паслаў да вас, кажучы: “Не кажыце: "Цяжар ГОСПАДА"”,

39 вось, Я падымаючы, падыму вас і выкіну ад аблічча Майго вас і горад, які Я даў вам і бацькам
вашым,
40 і аддам вас на сорам вечны і на ганьбу вечную, якая ня будзе забытая”».

Яр 24

1 ГОСПАД паказаў мне, і вось, два кашы фігаў пастаўлены перад сьвятыняй ГОСПАДА пасьля
таго, як Навухаданосар, валадар Бабілонскі, вывеў з Ерусаліму Ехонію, сына Егаякіма,
валадара Юды, і рамесьнікаў, і кавалёў, і завёў іх у Бабілон.
2 У адным кашы фігі вельмі добрыя, фігі раньнія, а ў другім кашы фігі вельмі кепскія, якія
нельга есьці, бо яны сапсутыя.
3 І сказаў мне ГОСПАД: «Што ты бачыш, Ярэмія?» І я сказаў: «Фігі. Фігі добрыя, вельмі добрыя,
і кепскія, вельмі кепскія, якія нельга есьці, бо яны сапсутыя».
4 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
5 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Як на гэтыя фігі добрыя, так Я гляджу на выгнанцаў Юды,
якіх Я выслаў з месца гэтага ў зямлю Халдэйцаў, дзеля дабра [для іх].
6 І Я зьвярну вочы Мае на іх дзеля дабра іхняга, і вярну іх у зямлю гэтую, і адбудую іх, і не
зруйную, і пасаджу іх, і ня вырву.
7 І дам ім сэрца, каб ведалі Мяне, што Я — ГОСПАД, і яны будуць для Мяне народам, а Я буду
для іх Богам, бо яны навернуцца да Мяне ўсім сэрцам сваім.
8 І як фігі кепскія, якія нельга есьці, бо яны сапсутыя, кажа ГОСПАД, так Я аддам Сэдэкію,
валадара Юды, і князёў ягоных, і рэшту Ерусаліму, тых, якія засталіся ў зямлі гэтай, і жыхароў
зямлі Эгіпецкай,
9 аддам іх на страхоцьце і на ліхоцьце для ўсіх валадарстваў зямлі, на ганьбу і на показку, на
пасьмешышча і на праклён на ўсякім месцы, куды Я выганю іх.
10 І Я пашлю на іх меч, голад і пошасьць, пакуль яны ня будуць зьнішчаныя з аблічча зямлі,
якую Я даў ім і бацькам іхнім».

Яр 25

1 Слова, якое было Ярэміі пра ўвесь народ Юды ў чацьвёртым годзе Егаякіма, сына Ёсіі,
валадара Юды, гэта значыць, у першым годзе Навухаданосара, валадара Бабілону,
2 якое Ярэмія прамовіў пра ўвесь народ Юды і пра ўсіх жыхароў Ерусаліму, кажучы:
3 «Ад трынаццатага году Ёсіі, сына Амона, валадара Юды, аж да дня гэтага, гэта значыць
дваццаць тры гады, было слова ГОСПАДА да мяне, і я прамаўляў да вас, устаючы ноччу,
прамаўляў, а вы ня слухалі.
4 І паслаў ГОСПАД да вас усіх слугаў Сваіх, прарокаў, устаючы ноччу і пасылаючы, але вы ня
слухалі, і не прыхілялі вушэй вашых, каб пачуць.
5 І яны казалі: “Адвярніцеся кожны ад шляху свайго ліхога і ад ліхоты ўчынкаў вашых, і жывіце
ў зямлі, якую даў ГОСПАД вам і бацькам вашым адвеку і на вякі.
6 І не хадзіце за багамі чужымі, каб служыць ім і пакланяцца ім, і не гнявіце Мяне справамі
рук вашых, і Я не прывяду на вас няшчасьце.
7 Але вы не паслухалі Мяне, кажа ГОСПАД, каб не гнявіць Мяне справамі рук вашых на ліха для
вас.
8 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “За тое, што вы не паслухалі словаў Маіх,
9 вось, Я пашлю і зьбяру ўсе плямёны поўначы, кажа ГОСПАД, і Навухаданосара, валадара
Бабілону, слугу Майго. І Я прывяду іх на зямлю гэтую, і на жыхароў ейных, і на ўсе народы
навокал, і зраблю іх закляцьцем, і ўчыню іх страхоцьцем, і пасьмешышчам, і руінай вечнай.
10 І Я зьнішчу ў іх голас вясёласьці і гоман радасьці, голас жаніха і голас нявесты, грукат
жорнаў і сьвятло лямпы.
11 І станецца ўся зямля гэтая руінаю і пусткаю, і будзе пакінутая, і будуць служыць народы
гэтыя валадару Бабілонскаму семдзясят гадоў.

12 І станецца, калі споўніцца семдзясят гадоў, Я пакараю валадара Бабілонскага і народ гэты,
кажа ГОСПАД, за беззаконьні іхнія, і зямлю Халдэйцаў, і зраблю яе пустэчай вечнай.
13 І, выконваючы, выканаю на зямлі гэтай усе словы Мае, якія Я прамовіў супраць яе; усё, што
напісана ў кнізе гэтай, што прарочыў Ярэмія адносна ўсіх народаў.
14 Бо зьняволяць іх народы шматлікія і валадары вялікія, і Я аднагароджу ім паводле ўчынкаў
іхніх, паводле справаў рук іхніх”.
15 Бо гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля да мяне: “Вазьмі з рукі Маёй келіх віна гневу гэтага і дай
яго піць усім народам, да якіх Я пасылаю цябе.
16 І яны будуць піць, і будуць хістацца, і ашалеюць перад абліччам мяча, які Я пашлю супраць
іх”.
17 І я ўзяў келіх з рукі ГОСПАДА, і напаіў усе народы, да якіх паслаў мяне ГОСПАД,
18 Ерусалім і гарады Юды, валадароў іхніх і князёў іхніх, каб зрабіць іх руінамі, на
аслупяненьне, на пасьмешышча і на праклён, як гэта ёсьць сёньня;
19 фараона, валадара Эгіпецкага, і слугаў ягоных, князёў ягоных і ўвесь народ ягоны,
20 і ўсе разнастайныя [народы] і ўсіх валадароў зямлі Уц, усіх валадароў зямлі Філістынскай,
Ашкелён, Газу, Экрон, і рэшту Ашдоду,
21 Эдом, Мааў і сыноў Амона,
22 усіх валадароў Тыру і ўсіх валадароў Сідону, усіх валадароў астравоў, якія на тым баку мора,
23 Дэдана і Тэму, Буза і ўсіх, якія стрыгуць валасы на скронях;
24 усіх валадароў Арабіі, усіх валадароў разнастайных народаў, якія жывуць у пустыні;
25 усіх валадароў Зімры, усіх валадароў Эляму і ўсіх валадароў Мадаю,
26 усіх валадароў поўначы, блізкіх і далёкіх, адных за другім; і ўсе валадарствы, якія на абліччы
зямлі, а валадар Шэшаху будзе піць пасьля іх.
27 І ты скажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Піце, і напівайцеся, і ванітуйце,
і падайце, і не ўставайце перад абліччам мяча, які Я пашлю супраць вас”.
28 І станецца, калі яны ня будуць хацець узяць келіх з рукі тваёй, каб піць, ты скажаш ім: “Гэта
кажа ГОСПАД Магуцьцяў. П’ючы, піць будзеце!
29 Бо вось, у горадзе, над якім клікалі імя Маё, Я пачынаю чыніць зло, а вы мелі б застацца без
пакараньня? Не застанецеся без пакараньня, бо Я клічу меч супраць усіх жыхароў зямлі, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў”.
30 А ты будзеш прарочыць ім усе словы гэтыя і скажаш ім: “ГОСПАД грыміць з вышыняў, з
Сялібы Сваёй сьвятой дае голас Свой, грымотамі грыміць супраць паселішчаў Сваіх, падымае
крык, як выціскачы [віна], адказвае да ўсіх жыхароў зямлі.
31 Даходзіць гармідар аж да канцоў зямлі, бо ГОСПАД вядзе спрэчку з народамі, кліча на суд
кожнае цела, злачынцаў аддае пад меч, кажа ГОСПАД”.
32 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Вось, гора пераходзіць з народу да народу, і бура вялікая
прачынаецца з канцоў зямлі.
33 І будуць забітыя ГОСПАДАМ у дзень гэты ад канца зямлі да канца зямлі, ніхто ня будзе [па
іх] плакаць, ані зьбіраць іх, ані хаваць іх; і стануцца яны, як гной на абліччы зямлі.
34 Лямантуйце, пастыры, і галасіце! Качайцеся ў пыле, пастухі авечак, бо надыйшлі дні зарэзу
вашага і расьцярушаньня вашага, і вы ўпадзеце, як начыньне каштоўнае.
35 І ня будзе схову для пастыраў, і ня будзе ратунку для пастухоў авечак.
36 [Чутны] голас крыку пастыраў і лямант пастухоў авечак, бо ГОСПАД пустошыць статак іхні.
37 І нішчацца пашы спакойныя перад абліччам полымя гневу ГОСПАДА.
38 Ён пакінуў як леў сховішча сваё, бо зямля Ягоная сталася пусткаю з прычыны ярасьці
прыгнятальніка, з прычыны полымя гневу [Госпада]”».

Яр 26

1 На пачатку валадараньня Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, было слова гэтае ад ГОСПАДА,
кажучы:

2 «Гэта кажа ГОСПАД. Стань на панадворку Дому ГОСПАДА і прамаўляй да [жыхароў] усіх
гарадоў Юды, якія прыходзяць у Дом ГОСПАДА пакланіцца, усе словы, якія Я загадаў табе
казаць, не абміні ані слова!
3 Можа, яны паслухаюць і адвернуцца кожны ад шляху свайго ліхога, і Я пашкадую [ўчыніць]
зло, якое Я задумаў зрабіць ім з прычыны ліхоты ўчынкаў іхніх.
4 І скажаш ім: "Гэта кажа ГОСПАД. Калі вы не паслухаеце Мяне, каб хадзіць паводле Закону
Майго, які Я паставіў перад абліччам вашым,
5 каб слухаць словы слугаў Маіх прарокаў, якіх Я пасылаў да вас, устаючы ўначы і пасылаючы,
але вы ня слухалі.
6 І Я зраблю з домам гэтым, як з Шыло, і горад гэты дам на праклён усім народам зямлі"».
7 І чулі сьвятары, і прарокі, і ўвесь народ Ярэмію, які прамаўляў словы гэтыя ў Доме ГОСПАДА.
8 І сталася, калі Ярэмія скончыў прамаўляць усё, што загадаў яму ГОСПАД прамовіць да ўсяго
народу, схапілі яго сьвятары, і прарокі, і ўвесь народ, кажучы: «Ты сьмерцю памрэш!
9 Навошта ты прарочыў у імя ГОСПАДА, кажучы: "Як Шыло будзе Дом гэты, і горад гэты будзе
зруйнаваны і [будзе] бязьлюдным"?» І ўвесь народ сабраўся супраць Ярэміі ў Доме ГОСПАДА.
10 І пачулі князі Юды словы гэтыя, і выйшлі з дому валадара ў Дом ГОСПАДА, і селі каля ўваходу
Новай Брамы [ў Доме] ГОСПАДА.
11 І сказалі сьвятары і прарокі да князёў і да ўсяго народу, кажучы: «Прысуд сьмерці для
чалавека гэтага, бо ён прарочыў супраць гораду гэтага, як [гэта] вы чулі ў вушах вашых».
12 І сказаў Ярэмія да ўсіх князёў і да ўсяго народу: «ГОСПАД паслаў мяне, каб прарочыць
супраць Дому гэтага і супраць гораду гэтага ўсе словы, якія вы чулі.
13 І цяпер выпраўце шляхі вашыя і ўчынкі вашыя, і слухайце голас ГОСПАДА, Бога вашага, і
ГОСПАД пашкадуе [ўчыніць] ліха, якое Ён прамовіў супраць вас.
14 А я, вось, у руках вашых. Рабіце са мной, што добра і справядліва ў вачах вашых.
15 Толькі, ведаючы, ведайце, што калі вы заб'яцё мяне, кроў нявінную вы сьцягнеце на сябе, і
на горад гэты, і на жыхароў ягоных, бо сапраўды паслаў мяне ГОСПАД да вас, каб прамовіць
да вас усе словы гэтыя».
16 І сказалі князі і ўвесь народ да сьвятароў і да прарокаў: «Не для чалавека гэтага прысуд
сьмерці, бо ён прамаўляў да нас у імя ГОСПАДА, Бога нашага».
17 І падняліся мужы спаміж старшыняў зямлі, і сказалі ўсёй царкве народу, кажучы:
18 «Міхей з Марэшэту прарочыў у дні Эзэкіі, валадара Юды, і ён казаў да ўсяго народу Юды,
кажучы: "Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Сыён будзе заараны як поле, Ерусалім станецца
руінамі, а гара Дому [Божага] — узгоркам лясным".
19 Ці сапраўды забіў яго Эзэкія, валадар Юды, і ўвесь Юда? Ці ж не спалохаўся ён ГОСПАДА і ці
не маліў аблічча ГОСПАДА, і ГОСПАД пашкадаваў, і [не ўчыніў] зла, якое прамовіў супраць іх.
А мы [хочам] учыніць зло вялікае адносна душаў нашых».
20 Быў таксама чалавек, які прарочыў у імя ГОСПАДА, Урыя, сын Шэмаі з Кірыят-Ярыму. Ён
прарочыў супраць гораду гэтага і супраць зямлі гэтай [словамі], як усе словы Ярэміі.
21 І пачулі валадар Егаякім і ўсе магнаты ягоныя, і ўсе князі словы ягоныя; і валадар шукаў,
каб забіць яго. І пачуў Урыя пра гэта, і спалохаўся, і ўцёк, і прыйшоў у Эгіпет.
22 І паслаў валадар Егаякім у Эгіпет Эльнатана, сына Ахбора, і людзей з ім у Эгіпет.
23 І яны вывелі Урыю з Эгіпту, і прывялі да валадара Егаякіма, і той ударыў яго мячом, і
парэшткі ягоныя ўкінуў у магілу сыноў народу.
24 Аднак рука Ахікама, сына Шафана, была з Ярэміем, каб ня быў ён аддадзены ў рукі народу,
каб забілі яго.

Яр 27

1 На пачатку валадараньня Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, было слова ГОСПАДА да Ярэміі,
кажучы:
2 «Гэта сказаў мне ГОСПАД. Зрабі сабе путы і ярмо, і ўзлажы сабе на шыю.

3 І пашлі іх да валадара Эдому, і валадара Мааву, і валадара сыноў Амона, і валадара Тыру, і
валадара Сідону праз рукі пасланцоў, якія ўвайшлі ў Ерусалім да Сэдэкіі, валадара Юды.
4 І загадаеш ім [перадаць] для паноў іхніх, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля.
Так маеце сказаць панам вашым:
5 "Я ўчыніў зямлю, чалавека і жывёлу, якія на абліччы зямлі, сілай Маёй вялікай і рамяном
Маім узьнятым; і Я даю яе таму, хто правы ў вачах Маіх.
6 І цяпер Я аддаў усе землі гэтыя ў рукі Навухаданосара, валадара Бабілонскага, слугі Майго.
Я аддаю яму таксама зьвяроў палявых, каб служылі яму.
7 І будуць служыць усе народы яму, і сыну ягонаму, і сыну сына ягонага, пакуль ня прыйдзе
час таксама для зямлі ягонай, і зьняволяць яе народы шматлікія і валадары вялікія.
8 І станецца, што валадарствы, якія ня будуць служыць Навухаданосару, валадару
Бабілонскаму, і якія ня схіляць карку свайго пад ярмо валадара Бабілонскага, Я наведаю
народы гэтыя мячом, голадам і заразай, кажа ГОСПАД, аж пакуль не [ўчыню] канец ім у руках
ягоных.
9 І вы ня слухайце прарокаў вашых, і варажбітоў вашых, і сноў вашых, і прадказальнікаў
вашых, і чараўнікоў вашых, якія вам гавораць, кажучы: “Ня будзеце служыць валадару
Бабілонскаму”.
10 Бо яны прарочаць вам хлусьню, каб выгнаць вас з зямлі вашай, і Я вас выганю, і вы пагінеце.
11 А народ, які схіліць карак свой пад ярмо валадара Бабілонскага і будзе служыць яму, Я
пакіну яго ў зямлі ягонай, кажа ГОСПАД, і ён будзе абрабляць яе і будзе жыць на ёй"”.
12 І да Сэдэкіі, валадара Юды, Я прамовіў паводле ўсіх словаў гэтых, кажучы: “Скарыце каркі
свае пад ярмо валадара Бабілонскага, і служыце яму і народу ягонаму, і будзеце жыць.
13 Дзеля чаго вы маеце паміраць, ты і народ твой, ад мяча, голаду і заразы, як гэта прамовіў
ГОСПАД пра народ, які ня будзе служыць валадару Бабілонскаму?
14 І ня слухайце словы прарокаў, якія кажуць: “Ня будзеце служыць валадару Бабілонскаму”,
бо яны прарочаць вам хлусьню.
15 Бо Я не пасылаў іх, кажа ГОСПАД, і яны прарочаць у імя Маё хлусьню, каб Я выгнаў вас, і
пагінеце вы і прарокі, якія прарочаць вам [гэта]”.
16 І да сьвятароў і да народу гэтага Я прамовіў, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД. Ня слухайце словы
прарокаў вашых, якія прарочаць вам: “Вось, начыньне Дому ГОСПАДА цяпер вернецца хутка
з Бабілону”, бо яны прарочаць вам хлусьню.
17 Ня слухайце іх, служыце валадару Бабілонскаму, і будзеце жыць. Навошта горад гэты мае
стацца руінамі?
18 А калі яны [сапраўды] прарокі і слова ГОСПАДА з імі, няхай яны заступаюцца ў ГОСПАДА
Магуцьцяў, каб начыньне, якое засталося ў Доме ГОСПАДА, і ў доме валадара Юды, і ў
Ерусаліме, не перайшло ў Бабілон.
19 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў пра слупы, пра мора мядзянае, пра падставы і пра рэшту
начыньня, якое засталося ў горадзе гэтым,
20 якое не забраў Навухаданосар, валадар Бабілонскі, калі павёў у няволю з Ерусаліму ў
Бабілон Ехонію, сына Егаякіма, валадара Юды, і ўсіх шляхетных Юды і Ерусаліму.
21 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, пра начыньне, якое засталося ў Доме ГОСПАДА,
і ў доме валадара Юды, і ў Ерусаліме:
22 "Будзе яно перанесена ў Бабілон і там будзе аж да дня, у які Я наведаю іх, кажа ГОСПАД. І Я
вазьму яго, і вярну на месца гэта"”».

Яр 28

1 І сталася ў той год на пачатку валадараньня Сэдэкіі, валадара Юды, у чацьвёртым годзе, у
пятым месяцы сказаў мне Хананія, сын Азура, прарок, які з Гібэону, у Доме ГОСПАДА перад
вачыма сьвятароў і ўсяго народу, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Я зламлю ярмо валадара Бабілонскага.

3 На працягу двух гадоў Я вярну на месца гэтае ўсё начыньне Дому ГОСПАДА, якое забраў
Навухаданосар, валадар Бабілонскі, з месца гэтага, і вывез у Бабілон.
4 І Ехонію, сына Егаякіма, валадара Юды, і ўсіх выгнанцаў з Юды, якія пайшлі ў Бабілон, Я
прывяду на месца гэтае, кажа ГОСПАД, бо Я зламлю ярмо валадара Бабілонскага».
5 І сказаў прарок Ярэмія прароку Хананіі перад вачыма сьвятароў і перад вачыма ўсяго народу,
які стаяў у Доме ГОСПАДА.
6 І сказаў прарок Ярэмія: «Амэн! Няхай так зробіць ГОСПАД! Няхай ГОСПАД споўніць слова
тваё, якое ты прарочыў, вяртаючы начыньне з Дому ГОСПАДА і ўсіх выгнаных у няволю з
Бабілону на месца гэтае!
7 Паслухай, аднак, слова гэтае, якое я прамаўляю ў вушы твае і ў вушы ўсяго народу.
8 Прарокі, якія былі перада мной і перад табой ад вякоў прарочылі супраць земляў шматлікіх
і супраць валадарстваў вялікіх, [кажучы] пра вайну, гора і заразу.
9 Прарок, які прарочыць пра супакой, калі споўніцца слова прарочае, будзе прызнаны за
прарока праўдзівага, якога паслаў ГОСПАД».
10 І ўзяў прарок Хананія ярмо з шыі Ярэміі прарока, і паламаў яго.
11 І сказаў Хананія перад вачыма ўсяго народу, кажучы: «Гэта кажа ГОСПАД. Гэтаксама Я
зламлю ярмо Навухаданосара, валадара Бабілонскага, [якое] на шыі ўсіх народаў, на працягу
двух гадоў». І пайшоў Ярэмія прарок сваёй дарогай.
12 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі пасьля таго, як паламаў прарок Хананія ярмо з шыі Ярэміі
прарока, кажучы:
13 «Ідзі і скажы Хананіі, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД. Ты паламаў ярмо драўлянае, але Я
падрыхтаваў замест яго ярмо жалезнае.
14 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Я ўскладу ярмо жалезнае на шыі ўсіх народаў
гэтых, каб яны, служачы, служылі Навухаданосару, валадару Бабілонскаму, і таксама зьвяроў
палявых падпарадкую яму”».
15 І сказаў прарок Ярэмія прароку Хананіі: «Слухай, Хананія! Не паслаў цябе ГОСПАД, але ты
дазволіў народу гэтаму мець надзею на хлусьню.
16 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: “Вось, Я выкіну цябе з аблічча зямлі. Ты памрэш у гэтым
годзе, бо ты абвясьціў бунт супраць ГОСПАДА”».
17 І памёр Хананія прарок у гэтым годзе, у сёмым месяцы.

Яр 29

1 А гэта словы ліста, які Ярэмія прарок паслаў з Ерусаліму да рэшты старшыняў, якія на
выгнаньні, і да сьвятароў, да прарокаў і да ўсяго народу, які Навухаданосар вывеў у няволю
з Ерусаліму ў Бабілон,
2 пасьля выхаду з Ерусаліму валадара Ехоніі, маці валадара, эўнухаў і князёў Юды і Ерусаліму,
кавалёў і рамесьнікаў з Ерусаліму.
3 [Ён паслаў яго] праз рукі Элеасы, сына Шафана, і Гемарыі, сына Хількіі, якіх паслаў Сэдэкія,
валадар Юды, да Навухаданосара, валадара Бабілонскага, у Бабілон, кажучы:
4 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, да ўсіх выгнаных у няволю, якіх Я выгнаў з
Ерусаліму ў Бабілон.
5 Будуйце дамы і жывіце ў іх, садзіце сады і спажывайце плады іхнія.
6 Бярыце жонак і нараджайце сыноў і дачок, і бярыце жонак для сыноў вашых, і дачок вашых
давайце мужам, каб яны нараджалі сыноў і дачок; і памнажайцеся там, і не зьмяншайцеся!
7 І клапаціцеся пра супакой для гораду, у які Я выгнаў вас, і маліцеся за яго да ГОСПАДА, бо ў
супакоі ягоным будзе і для вас супакой.
8 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Няхай ня зводзяць вас прарокі вашыя, якія сярод
вас, і варажбіты вашыя; не зьвяртайце ўвагі на сны вашыя, якія вы сьніцё.
9 Бо яны прарочаць вам хлусьню ў імя Маё. Я не пасылаў іх, кажа ГОСПАД.
10 Бо гэта кажа ГОСПАД. Калі споўніцца для Бабілону семдзясят гадоў, Я наведаю вас і
зьдзейсьню для вас добрае слова Маё, каб вярнуць вас на месца гэтае.

11 Бо Я ведаю намеры, якія Я маю адносна вас, кажа ГОСПАД, намеры супакою, а ня гора, каб
даць вам будучыню і надзею.
12 Вы будзеце клікаць Мяне, і пойдзеце, і будзеце маліцца да Мяне, і Я выслухаю вас.
13 І будзеце шукаць Мяне, і знойдзеце, калі будзеце шукаць Мяне ўсім сэрцам вашым.
14 І Я буду знойдзены вамі, кажа ГОСПАД, і Я адмяню няволю вашую і зьбяру вас спасярод усіх
народаў і з усіх месцаў, у якія Я выгнаў вас, кажа ГОСПАД, і вярну вас у месца, з якога Я выгнаў
вас.
15 Бо вы кажаце: “Паставіў нам ГОСПАД прарокаў у Бабілоне!”
16 Але гэта кажа ГОСПАД да валадара, які сядзіць на пасадзе Давіда, і да ўсяго народу, які жыве
ў горадзе гэтым, да братоў вашых, якія ня выйшлі з вамі на выгнаньне:
17 “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Вось, Я пашлю на іх меч, голад і заразу, і зраблю з імі так, як
з сапсутымі фігамі, якія нельга есьці, бо яны сапсутыя.
18 І Я буду перасьледаваць іх мячом, голадам і заразай, і аддам іх на страхоцьце для ўсіх
валадарстваў зямлі, на праклён, на аслупяненьне, на насьмешку і на ганьбу сярод усіх
народаў, да якіх Я выгнаў іх,
19 за тое, што яны ня слухалі словаў Маіх, кажа ГОСПАД, якія Я пасылаў да іх праз слугаў Маіх
прарокаў, устаючы ўначы і пасылаючы, а яны ня слухалі, кажа ГОСПАД”.
20 А вы, усе выгнанцы, якіх Я выгнаў з Ерусаліму ў Бабілон, слухайце слова ГОСПАДА.
21 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, пра Ахава, сына Каляі, і Сэдэкію, сына Маасэі,
якія прарочаць вам хлусьню ў імя Маё. Вось, Я аддам іх у рукі Навухаданосара, валадара
Бабілонскага, і ён заб’е іх на вачах вашых.
22 І будзе ўзяты з іх [прыклад] праклёну для ўсіх выгнанцаў Юды, якія ў Бабілоне, [і будуць
казаць], кажучы: “Няхай зробіць табе ГОСПАД як Сэдэкіі і Ахаву, якіх валадар Бабілонскі
смажыў на агні”,
23 за тое, што яны ўчынілі агіду ў Ізраілі, і чужаложылі з жонкамі бліжніх сваіх, і прамаўлялі
ў імя Маё слова хлусьні, якога Я ім не загадваў. Я ведаю [гэта], і Я — сьведка [гэтага], кажа
ГОСПАД.
24 А Шэмаі з Нэхеламу скажаш, кажучы:
25 “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. За тое, што ты паслаў лісты ў імя сваё да ўсяго
народу, які ў Ерусаліме, і да Сафоніі, сына Маасэі, сьвятара, і да ўсіх сьвятароў, кажучы:
26 "ГОСПАД паставіў цябе сьвятаром на месца Егаяды сьвятара, каб ты быў наглядчыкам у Доме
ГОСПАДА над кожным чалавекам, які шалее і прарочыць, каб яго аддаў у вязьніцу і ў кайданы.
27 І цяпер, чаму ты не забараніў [гаварыць] Ярэміі з Анатоту, які прарочыць да вас?
28 Бо ён прыслаў да нас, у Бабілон, кажучы: ‘Доўга гэта [будзе]. Будуйце дамы і жывіце ў іх,
садзіце сады, і ешце плады іхнія!’""”
29 І прачытаў сьвятар Сафонія ліст гэты ў вушы Ярэміі прарока.
30 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
31 “Пашлі да ўсіх выгнанцаў, кажучы: "Гэта кажа ГОСПАД да Шэмаі з Нэхеламу. За тое, што
прарочыў вам Шэмая, а Я не пасылаў яго, і ён умацоўваў спадзяваньне вашае на хлусьню,
32 за гэта, кажа ГОСПАД, Я наведаю Шэмаю з Нэхеламу і насеньне ягонае. Ня будзе ён мець
чалавека, які будзе жыць сярод народу гэтага, і ня ўбачыць ён дабра, якое Я зраблю народу
Майму, кажа ГОСПАД, бо ён прамаўляў бунтоўнае супраць ГОСПАДА""».

Яр 30

1 Слова, якое было ад ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Напішы ў кнізе ўсе словы, якія Я прамовіў да цябе.
3 Бо вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я вярну з выгнаньня народ Мой, Ізраіля і Юду, кажа
ГОСПАД, і прывяду іх у зямлю, якую Я даў бацькам іхнім, і яны возьмуць яе на ўласнасьць».
4 А гэта словы, якія прамовіў ГОСПАД да Ізраіля і Юды:
5 «Гэта кажа ГОСПАД. Пачулі мы голас страху і трывогі, і няма супакою.

6 Спытайцеся, прашу, і паглядзіце, ці можа нараджаць мужчына? Чаму ж Я бачу ўсіх
мужчынаў з рукамі на сьцёгнах іхніх, як у той, якая нараджае, і ўсе абліччы зьбялелі?
7 Гора, бо вялікі той дзень, няма падобнага яму! Будзе гэта час прыгнёту Якуба, але ён будзе
збаўлены ад яго.
8 І будзе ў той дзень, кажа ГОСПАД, Я скрышу ярмо на шыі іхняй і путы іхнія парву, і ня будуць
больш зьневаляць яго чужынцы.
9 І будуць яны служыць ГОСПАДУ, Богу свайму, і Давіду, валадару свайму, якога Я пастаўлю
для іх.
10 А ты ня бойся, слуга Мой, Якуб, кажа ГОСПАД, і не палохайся, Ізраіль, бо вось, Я вызвалю
цябе з [зямлі] далёкай і насеньне тваё — з зямлі палону іхняга. І вернецца Якуб, і адпачне, і
будзе ў бясьпецы, і ніхто ня будзе трывожыць [яго].
11 Бо Я з табою, кажа ГОСПАД, каб збавіць цябе. Бо Я зраблю канец усім народам, сярод якіх
Я расьцярушыў цябе, але табе не зраблю канца, аднак пакараю цябе паводле суду і не пакіну
цябе без пакараньня.
12 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Невылечны пералом твой, незагойная рана твая,
13 няма таго, хто рупіцца пра справу тваю, няма лекаў для раны, каб вылячыць цябе.
14 Усе, што любілі цябе, забыліся пра цябе, і не шукаюць цябе, бо Я ўдарыў цябе ўдарам
варожым, жудаснай карай за шматлікія беззаконьні твае, бо памножыліся грахі твае.
15 Чаго ты крычыш пра пералом твой? Невылечны боль твой. За шматлікія беззаконьні твае і
[за тое,] што памножыліся грахі твае, Я зрабіў гэта табе.
16 Дзеля гэтага ўсе, што зьядаюць цябе, самі будуць зьедзеныя, і ўсе прыгнятальнікі твае
пойдуць у няволю, і тыя, што нішчылі цябе, стануцца здабычай, і ўсіх, што рабавалі цябе, Я
аддам на рабаваньне.
17 Бо Я вярну здароўе тваё і аздараўлю цябе ад ранаў тваіх, кажа ГОСПАД, бо “адкінутым”,
“якога ніхто не шукае”, назвалі цябе, Сыёне.
18 Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я зноў вярну з няволі намёты Якуба і зьлітуюся над сялібамі
ягонымі. І будзе адбудаваны горад на ўзгорку сваім, і палац будзе стаяць на месцы сваім.
19 І выйдзе з яго падзяка і голас тых, якія радуюцца, і Я памножу іх, і ня будуць зьмяншацца, і
Я праслаўлю іх, і ня будуць пагарджаныя.
20 І будуць сыны ягоныя як даўней, і сход ягоны будзе моцны перад абліччам Маім, і Я наведаю
ўсіх, якія ўціскаюць яго.
21 І будзе з яго Магутны ягоны, і Пан ягоны паўстане спасярод яго. І Я набліжу яго да Сябе, і
ён наблізіцца да Мяне, бо хто ёсьць той, хто адважыцца ў сэрцы сваім наблізіцца да Мяне? —
кажа ГОСПАД.
22 І вы будзеце для мяне народам, а Я буду для вас Богам.
23 Вось, віхура ад ГОСПАДА, гнеў [Ягоны] прыходзіць, віхура страшэзная спадзе на галовы
бязбожнікаў.
24 Ня спыніцца полымя гневу ГОСПАДА, пакуль Ён ня споўніць і ня зьдзейсьніць намераў сэрца
Свайго. У апошнія дні зразумееце гэта.

Яр 31

1 У гэты час, кажа ГОСПАД, Я буду Богам для ўсіх родаў Ізраіля, а яны будуць Маім народам”.
2 Гэта кажа ГОСПАД. Знайшоў ласку ў пустыні народ, які ўратаваўся ад мяча. Ізраіль пойдзе
да месца супачынку свайго.
3 Здалёк зьявіўся мне ГОСПАД [і сказаў]: “Любоўю вечнаю Я палюбіў цябе, дзеля гэтага Я
выяўлю міласэрнасьць табе.
4 Я зноў адбудую цябе, і будзеш ты адбудаваная, дзяўчына Ізраіля. Ты зноў аздобішся бубнамі
тваімі і выйдзеш у карагодзе тых, якія радуюцца.
5 Ты зноў будзеш садзіць вінаграднікі на гарах Самарыі, і будуць садзіць іх земляробы твае, і
будуць спажываць [плады].

6 Бо надыйдзе дзень, калі вартаўнікі закрычаць на гары Эфраіма: “Уставайце, узыйдзем на
Сыён да ГОСПАДА, Бога нашага”.
7 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Усклікайце для Якуба з радасьцю, весяліцеся перад галавою народаў!
Абвяшчайце, хваліце і кажыце: "Збаў, ГОСПАДЗЕ, народ Твой, рэшту Ізраіля!"
8 Вось, Я прывяду іх з зямлі паўночнай і зьбяру іх з канцоў зямлі, між імі сьляпы і кульгавы,
цяжарная і тая, што нараджае, разам, як царква вялікая, яны вяртаюцца сюды.
9 Яны выйшлі з плачам, Я прывяду іх з малітваю, Я павяду іх да струмянёў вады шляхам
простым, ня будуць яны спатыкацца на ім, бо Я стаўся для Ізраіля бацькам, і Эфраім —
першародны Мой.
10 Паслухайце слова ГОСПАДА, народы, і абвясьціце на астравах далёкіх, і кажыце: “Той, Які
расьцярушыў Ізраіля, зьбярэ яго, і будзе пільнаваць яго, як пастух статак свой”.
11 Бо адкупіў ГОСПАД Якуба і вызваліў яго з рукі дужэйшага за яго.
12 І прыйдуць яны, і будуць весяліцца на вяршыні Сыёну, і прыгарнуцца да даброцьцяў
ГОСПАДА, да збожжа, і віна, і алею, авечак і быдла; і станецца душа іхняя як сад напоены
[вадой], і ня будуць больш жыць у нястачы.
13 Тады будзе радавацца дзяўчына ў танцы, і юнакі, і старыя разам [з ёю]. І Я перамяню жалобу
іхнюю ў радасьць, і суцешу іх, і ўзьвесялю іх ад смутку іхняга.
14 І Я напоўню душу сьвятароў тлустасьцю, і народ Мой будзе насычаны даброцьцямі Маімі,
кажа ГОСПАД”.
15 Гэта кажа ГОСПАД: “Чуецца голас у Раме, галашэньне і горкі плач. Рахель плача над сынамі
сваімі і ня хоча быць суцешанай дзеля сыноў сваіх, бо іх няма”.
16 Гэта кажа ГОСПАД: “Стрымай голас твой ад плачу і вочы твае ад сьлёзаў, бо ёсьць нагарода
за працу тваю, кажа ГОСПАД, і яны вернуцца з зямлі варожай.
17 І ёсьць надзея дзеля будучыні тваёй, кажа ГОСПАД, і вернуцца сыны твае ў межы свае”.
18 Чуючы, Я чуў Эфраіма, які скардзіцца: “Ты пакараў мяне, і я пакараны, як цяля ненавучанае.
Навярні мяне, і я навярнуся, бо Ты — ГОСПАД, Бог мой!
19 Бо калі Ты навярнуў мяне, я каяўся, і калі я быў навучаны, я ўдарыў па сьцёгнах [сваіх],
засаромеўся і зьбянтэжыўся, бо я нашу ганьбу маладосьці маёй”.
20 Ці ты, Эфраім, не дарагі сын для Мяне і ці не дзіцё любае? Бо колькі разоў прамаўляю
супраць яго, заўжды, памятаючы, памятаю яго. Таму хвалюецца ўнутранасьць Мая дзеля яго,
і, літуючыся, зьлітуюся над ім, кажа ГОСПАД.
21 Пастаў сабе ўказальнікі, парастаўляй сабе знакі на дарогах, зьвярні сэрца тваё на бітую
дарогу, на шлях, па якім ты ішла, і вярніся, дзяўчына Ізраіля, вярніся ў гарады твае!
22 Дакуль будзеш бадзяцца, дачка бунтоўная? Бо ГОСПАД стварыў рэч новую на зямлі:
жанчына збавіць мужа”.
23 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Усьцяж будуць паўтараць слова гэтае ў зямлі
Юды і ў гарадах ейных, калі Я перамяню долю іхнюю: "Няхай дабраславіць цябе ГОСПАД,
жытло праведнасьці, гара сьвятая".
24 І будзе жыць у ёй Юда, і ў-ва ўсіх гарадах ейных, разам земляробы і тыя, што ходзяць за
статкам.
25 Бо Я напаю душу спрагнёную, і кожную душу саслабелую насычу”».
26 На гэтым я прачнуўся і разгледзеўся, і сон мой быў прыемны для мяне.
27 «Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я засею дом Ізраіля і дом Юды насеньнем людзей і
насеньнем быдла.
28 І станецца, як Я чуваў на імі, каб вырываць і раскідаць, руйнаваць і нішчыць, і рабіць зло,
так буду чуваць на імі, каб адбудаваць і засадзіць, кажа ГОСПАД.
29 У тыя дні ня будуць яны больш казаць: "Бацькі елі горкія ягады, а зубы сыноў здрантвелі",
30 бо кожны памрэ за беззаконьне сваё, і кожнаму, хто будзе есьці горкія ягады, здрантвеюць
зубы ягоныя.
31 Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я заключу з домам Ізраіля і з домам Юды новы
запавет.

32 Не такі запавет, які Я заключыў з бацькамі іхнімі ў дзень, калі ўзяў іх за руку, каб вывесьці іх
з зямлі Эгіпецкай. Той запавет Мой яны парушылі, хоць Я быў Гаспадаром іхнім, кажа ГОСПАД.
33 Бо вось запавет, які Я заключу з домам Ізраіля пасьля дзён тых, кажа ГОСПАД. Я разьмяшчу
Закон Мой у нутры іхнім, і ў сэрцы іхнім напішу яго, і буду для іх Богам, а яны будуць для
Мяне народам.
34 І ня будзе вучыць больш чалавек бліжняга свайго і кожны брата свайго, кажучы: “Пазнайце
ГОСПАДА”, бо ўсе, ад найменшага з іх да найбольшага, будуць ведаць Мяне, кажа ГОСПАД, бо
Я прабачу беззаконьні іхнія, і пра грахі іхнія ня буду больш узгадваць.
35 Гэта кажа ГОСПАД, Які дае сонцу сьвяціць днём, парадак месяцу і зоркам сьвяціць ноччу,
Які хвалюе мора, і шумяць хвалі ягоныя, ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае.
36 Калі адыйдзе парадак гэты ад аблічча Майго, кажа ГОСПАД, тады насеньне Ізраіля перастане
быць народам перад абліччам Маім на ўсе дні.
37 Гэта кажа ГОСПАД. Калі магчыма зьмераць неба ўгары і дасьледаваць падваліны зямлі ўнізе,
тады Я адкіну ўсё насеньне Ізраіля за ўсё тое, што яны зрабілі, кажа ГОСПАД.
38 Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і будзе адбудаваны горад ГОСПАДА ад вежы Хананээль
аж да Кутняй Брамы.
39 І будзе цягнуцца далей шнур меральны аж да ўзгорку Гарэб, і зьверне да Гааты.
40 І ўся даліна трупаў і попелу, усе палі аж да ручая Кедрон, да рагу Брамы Конскай на ўсход
[будуць] сьвятыняй ГОСПАДА, і ня будуць яны больш зруйнаваныя і зьнішчаныя на вякі».

Яр 32

1 Слова, якое было ад ГОСПАДА да Ярэміі ў дзясятым годзе Сэдэкіі, валадара Юды, значыцца, у
васямнаццатым годзе Навухаданосара.
2 Тады войска валадара Бабілонскага трымала ў аблозе Ерусалім, а Ярэмія прарок быў
увязьнены на панадворку вартоўні ў доме валадара Юды.
3 Увязьніў яго там Сэдэкія, валадар Юды, кажучы: «Навошта ты прарочыш, кажучы: “Гэта кажа
ГОСПАД. Вось, Я аддам горад гэты ў рукі валадара Бабілонскага, і ён здабудзе яго.
4 А Сэдэкія, валадар Юды, не ўцячэ з рук Халдэйцаў, але выдаваньнем будзе выдадзены ў рукі
валадара Бабілонскага, і будзе прамаўляць вуснамі сваімі ў вусны ягоныя, і вачыма сваімі
ўбачыць вочы ягоныя.
5 І ён павядзе Сэдэкію ў Бабілон, і ён будзе там, пакуль Я не наведаю яго, кажа ГОСПАД, бо калі
вы будзеце ваяваць з Халдэйцамі, не пашчасьціць вам”».
6 І сказаў Ярэмія: «Было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
7 “Вось, Ханамээль, сын Шальлюма, дзядзькі твайго, ідзе да цябе, кажучы: "Купі сабе поле маё,
якое ў Анатоце, бо ты маеш права выкупу, каб набыць [яго] "”.
8 І прыйшоў да мяне Ханамээль, сын дзядзькі майго, паводле слова ГОСПАДА на панадворак
вартоўні, і сказаў мне: “Купі, прашу, поле маё, якое ў Анатоце ў зямлі Бэн’яміна, бо ты маеш
права спадчыны і выкупу. Купі [яго] сабе!” І я зразумеў, што гэта [было] слова ГОСПАДА.
9 І я купіў поле ад Ханамээля, сына дзядзькі майго, поле, якое ў Анатоце, і адважыў яму срэбра,
сямнаццаць сыкляў срэбра,
10 і напісаў дамову, і запячатаў, і ўзяў сьведкаў, і адважыў срэбра на вагах.
11 І потым я ўзяў дамову куплі, запячатаную паводле прыказаньня і пастановаў, і [дамову]
адкрытую.
12 І даў я дамову куплі Баруху, сыну Нэрыя, сына Махсэя, на вачах Ханамээля, [сына] дзядзькі
майго, і на вачах сьведкаў, напісаных у дамове куплі, і на вачах усіх [людзей] Юды, якія былі
на панадворку вартоўні.
13 І я загадаў Баруху на вачах іхніх, кажучы:
14 “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вазьмі лісты гэтыя, дамову куплі запячатаную і
дамову адкрытую, і зьмясьці [іх] у пасудзіну гліняную, каб захаваліся на шмат дзён.
15 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: "Будуць яшчэ купляць дамы, палі і вінаграднікі
ў зямлі гэтай"”.

16 І маліўся я да ГОСПАДА пасьля таго, як аддаў дамову куплі Баруху, сыну Нэрыя, кажучы:
17 “О, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, вось, Ты ўчыніў неба і зямлю вялікай сілаю Тваёю і рамяном Тваім
узьнятым. Не складаная для Цябе ніякая рэч.
18 Ты зьяўляеш міласэрнасьць для тысячаў [пакаленьняў], але адплачваеш за беззаконьні
бацькоў ва ўлоньне сыноў іхніх пасьля іх. ГОСПАД Магуцьцяў — імя Тваё.
19 Ты вялікі ў радзе і магутны ў справах. Вочы Твае адкрытыя на ўсе шляхі сыноў чалавечых,
каб даць кожнаму паводле шляхоў ягоных і паводле пладоў учынкаў ягоных.
20 Ты чыніў знакі і цуды ў зямлі Эгіпецкай, і аж да дня гэтага ў Ізраілі і сярод людзей, і Ты
зрабіў Сабе імя, [якое маеш] сёньня.
21 І Ты вывеў народ Твой, Ізраіль, з зямлі Эгіпецкай знакамі і цудамі, і рукою магутнаю, і
рамяном узьнятым сярод трывогі вялікай.
22 І Ты даў ім зямлю гэтую, якую запрысяг даць бацькам іхнім, зямлю, якая ацякае ў мёд і
малако.
23 І яны прыйшлі, і ўзялі яе на ўласнасьць, але ня слухалі голасу Твайго, і не хадзілі паводле
Закону Твайго, і не рабілі ўсяго таго, што Ты загадаў ім. І Ты навёў на іх усё ліха гэтае.
24 Вось, валы падыходзяць да гораду, каб здабыць яго, і горад будзе аддадзены ў рукі
Халдэйцаў, якія ваююць супраць яго, на пажыву мяча, голаду і заразы. Тое, што Ты прамовіў,
зьдяйсьняецца, і, вось, Ты бачыш [гэта]!
25 А Ты, Госпадзе ГОСПАДЗЕ, сказаў мне: "Купі сабе поле за срэбра і пакліч сьведкаў", а горад
будзе аддадзены ў рукі Халдэйцаў!”»
26 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
27 «Вось, Я — ГОСПАД, Бог кожнага цела. Ці можа быць для Мяне нечаканай нейкая справа?
28 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: “Вось, Я аддам горад гэты ў рукі Халдэйцаў і ў руку
Навухаданосара, валадара Бабілонскага, і ён здабудзе яго.
29 І ўвойдуць у яго Халдэйцы, якія ваююць супраць гораду гэтага, і падкладуць агонь пад горад
гэты, і спаляць яго, і дамы, у якіх складалі ахвяры Баалу на дахах іхніх і вылівалі ахвяры вадкія
іншым багам, каб гнявіць Мяне.
30 Бо ад маладосьці сваёй сыны Ізраіля і сыны Юды рабілі толькі ліхоту на вачах Маіх, бо сыны
Ізраіля толькі гнявілі Мяне ўчынкамі рук сваіх, кажа ГОСПАД.
31 Бо прычынай гневу Майго і абурэньня Майго стаўся для Мяне горад гэты ад дня, калі
пабудавалі яго, аж да дня сёньняшняга. Я адкіну яго ад аблічча Майго,
32 за ўсе злачынствы сыноў Ізраіля і сыноў Юды, якія яны рабілі, каб гнявіць Мяне, яны,
валадары іхнія, князі іхнія, сьвятары іхнія і прарокі іхнія, і мужы Юды, і жыхары Ерусаліму.
33 І яны павярнуліся да Мяне патыліцаю, а не аблічча, і, хоць Я навучаў іх, устаючы ўначы і
навучаючы, але яны не хацелі слухаць, каб прыняць настаўленьне.
34 І яны паставілі брыдоты свае ў Доме, над якім клікалі імя Маё, каб зьневажаць яго.
35 І яны пабудавалі ўзгоркі для Баала, якія ў даліне Бэн-Гіном, каб праводзіць праз агонь сыноў
сваіх і дочак сваіх дзеля Малоха. Я не загадваў ім гэтага, і не прыходзіла на сэрца Маё, каб
рабіць такую брыдоту і давесьці Юду да грэху”.
36 І цяпер гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля, пра горад гэты, пра які вы кажаце, што ён будзе
выдадзены ў рукі валадара Бабілонскага мячом, голадам і заразай:
37 “Вось, Я зьбяру іх з усіх земляў, у якія Я выгнаў іх у гневе Маім і ў абурэньні вялікім, і вярну
іх на месца гэтае, і дам ім жыць бясьпечна.
38 І будуць яны для Мяне народам, а Я буду для іх Богам.
39 І дам ім адно сэрца і адзін шлях, каб баяліся Мяне ў-ва ўсе дні, каб добра было ім і сынам
іхнім пасьля іх.
40 І Я заключу з імі запавет вечны, што не адвярнуся ад іх, каб рабіць дабро ім, і страх Мой
укладу ў сэрца іхняе, каб яны не адступаліся ад Мяне.
41 І Я буду цешыцца з іх, калі буду рабіць дабро для іх, і пасялю іх у зямлі гэтай у праўдзе, з
усяго сэрца Майго і з усёй душы Маёй”.

42 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Як спаслаў Я на народ гэты ўсякае ліха вялікае, так Я спашлю на
народ гэты ўсё дабро, якое абяцаў ім.
43 І будуць набываць палі ў зямлі гэтай, пра якую вы кажаце: "Гэта пустэча, без чалавека і бяз
быдла, і яна аддадзена ў рукі Халдэйцаў".
44 І будуць купляць палі за срэбра, і будуць пісаць дамовы, і запячатваць іх, і клікаць сьведкаў
у зямлі Бэн’яміна, у ваколіцах Ерусаліму, у гарадах Юды, у гарадах горных, у гарадах
лагчынных і ў гарадах Нэгеву, бо Я вярну палонных іхніх, кажа ГОСПАД”».

Яр 33

1 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі другі раз, калі ён быў яшчэ ўвязьнены на панадворку
вартоўні, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД, Які ўчыніў [зямлю], ГОСПАД, Які ўкшталтаваў і ўмацаваў яе, ГОСПАД —
імя Ягонае.
3 Пакліч Мяне, і Я адкажу табе, і абвяшчу табе вялікае і недасяжнае, чаго ты ня ведаеш.
4 Бо гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля, пра дамы гораду гэтага, пра дамы валадароў Юды, якія
руйнуюцца на ўмацаваньні і ад мяча,
5 якія ідуць на змаганьне з Халдэйцамі, і якія напоўняцца трупамі людзей, якіх Я заб’ю ў гневе
Маім і ў лютасьці Маёй, і Я схаваў аблічча Маё ад гораду гэтага за ўсе ліхоты ягоныя.
6 Вось, Я загаю ім рану, і вылячу, і аздараўлю іх, і выяўлю ім шчодрасьць супакою і праўды.
7 І Я вярну палонных Юды і палонных Ізраіля, і адбудую іх як раней.
8 І Я ачышчу іх ад усіх беззаконьняў, якімі яны грашылі супраць Мяне, і прабачу ўсе беззаконьні
іхнія, якімі яны грашылі супраць Мяне, і праз якія яны адыйшлі ад Мяне.
9 І станецца [Ерусалім] у Мяне імем радасьці і хвалы, і славы для ўсіх народаў зямлі, якія
пачуюць пра ўсе дабарадзействы, што Я зрабіў яму. І будуць яны баяцца, і будуць трымцець
дзеля ўсяго дабра і дзеля ўсяго супакою, якія Я зрабіў для яго.
10 Гэта кажа ГОСПАД. На гэтым месцы, пра якое вы кажаце: “Гэта руіны, без людзей і без
жывёлы”, у гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму, спустошаных, без людзей, без жыхароў, без
жывёлы, зноў будзе чутны
11 голас вясёласьці і голас радасьці, голас жаніха і голас нявесты, голас тых, якія кажуць:
“Хваліце ГОСПАДА Магуцьцяў, бо добры ГОСПАД, бо на вякі міласэрнасьць Ягоная!”, і якія
складаюць ахвяры падзякі ў Доме ГОСПАДА, бо Я вярну як [было] раней долю зямлі гэтай,
кажа ГОСПАД.
12 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. На месцы гэтым зруйнаваным, без людзей і без жывёлы, і ў-ва
ўсіх гарадах ягоных будзе зноў прыстанішча для пастухоў, якія прыгналі авечак на адпачынак.
13 У гарадах горных, у гарадах лагчынных, у гарадах Нэгеву, у зямлі Бэн’яміна, у ваколіцах
Ерусаліму і ў гарадах Юды зноў будуць праходзіць авечкі праз рукі таго, хто [іх] лічыць, кажа
ГОСПАД.
14 Вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я споўню добрае слова, якое Я прамовіў дому Ізраіля
і дому Юды.
15 У тыя дні і ў той час Я вырашчу Давіду Парастак праведны, і будзе Ён чыніць суд і
праведнасьць на зямлі.
16 У тыя дні Юда будзе збаўлены, і Ерусалім будзе жыць у бясьпецы. І вось імя, якім будуць
клікаць яго: “ГОСПАД — праведнасьць нашая”.
17 Бо гэта кажа ГОСПАД. Не застанецца Давід бяз мужа, які сядзіць на пасадзе дому Ізраіля.
18 І сьвятары лявіты не застануцца бяз мужа перад абліччам Маім, які будзе складаць
цэласпаленьні, паліць ахвяры хлебныя і прыносіць ахвяры ў-ва ўсе дні».
19 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
20 «Гэта кажа ГОСПАД. Калі можаце парушыць запавет Мой [адносна] дня і запавет Мой
[адносна] ночы, каб не было ані дня, ані ночы ў часе іхнім,
21 тады можа быць парушаны запавет Мой з Давідам, слугою Маім, каб ня меў ён сына, які
будзе валадарыць на пасадзе ягоным, і з лявітамі сьвятарамі, слугамі Маімі.

22 Як незьлічоныя войскі нябесныя і як нязьмерны пясок марскі, так Я памножу насеньне
Давіда, слугі Майго, і лявітаў, слугаў Маіх».
23 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
24 «Ці не заўважыў ты, што народ гэты кажа: “ГОСПАД адкінуў абедзьве сям’і, якія выбраў!” І
яны пагарджаюць народам Маім, як быццам ён ужо не народ перад абліччам іхнім.
25 Гэта кажа ГОСПАД. Калі няма запавету Майго адносна дня і адносна ночы, калі Я не паставіў
статуты для неба і зямлі,
26 тады Я адкіну насеньне Якуба і Давіда, слугі Майго, і не вазьму з насеньня ягонага тых, хто
пануе над насеньнем Абрагама, Ісаака і Якуба, бо Я, перамяняючы, перамяню долю іхнюю і
пашкадую іх».

Яр 34

1 Слова, якое было ад ГОСПАДА да Ярэміі, калі Навухаданосар, валадар Бабілонскі, і ўсё
войска ягонае, і ўсе валадарствы зямлі, падуладныя руцэ ягонай, і ўсе народы ваявалі супраць
Ерусаліму і ўсіх гарадоў ягоных, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Ідзі і скажы Сэдэкіі, валадару Юды, і скажы яму: “Гэта кажа
ГОСПАД. Вось, Я аддам горад гэты ў рукі валадара Бабілонскага, і ён спаліць яго агнём.
3 І ты не ўцячэш ад рукі ягонай, будзеш схоплены і выдадзены ў рукі ягоныя, і вочы твае
ўбачаць вочы валадара Бабілонскага, і вусны твае будуць прамаўляць да вуснаў ягоных, і ты
пойдзеш у Бабілон.
4 Аднак паслухай слова ГОСПАДА, Сэдэкія, валадар Юды. Гэта кажа ГОСПАД пра цябе. Ты не
памрэш ад мяча.
5 Ты памрэш у супакоі, і падобна, як палілі пахошчы для бацькоў тваіх, валадароў даўнейшых,
якія былі перад табою, так будуць паліць і для цябе. І будуць галасіць па табе: "Аёй! Аёй!", бо
Я прамовіў слова, кажа ГОСПАД”».
6 І прамовіў прарок Ярэмія Сэдэкіі, валадару Юды, усе словы гэтыя ў Ерусаліме.
7 А войска валадара Бабілонскага ваявала супраць Ерусаліму і супраць усіх пазасталых гарадоў
Юды, супраць Ляхішу і Азэкі, бо толькі гэтыя гарады ўмацаваныя трымаліся спаміж усіх
гарадоў Юды.
8 Слова, якое было да Ярэміі ад ГОСПАДА пасьля заключэньня валадаром Сэдэкіем запавету з
усім народам Ерусаліму, каб абвясьціць для іх свабоду,
9 каб кожны адпусьціў на свабоду нявольніка свайго і нявольніцу сваю, Гебрая і Гебрайку, каб
ніхто не трымаў у нявольніцтве брата свайго Юдэя.
10 І згадзіліся ўсе князі і ўсе людзі, якія заключылі запавет, выпусьціць на свабоду кожны
нявольніка свайго і кожны нявольніцу сваю і не трымаць іх у нявольніцтве. І яны згадзіліся, і
адпусьцілі [іх].
11 Але потым яны, вяртаючы, вярнулі нявольнікаў і нявольніцаў, якіх адпусьцілі на свабоду, і
прымусам прымусілі, [каб яны былі] нявольнікамі і нявольніцамі.
12 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі ад ГОСПАДА, кажучы:
13 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Я заключыў запавет з бацькамі вашымі ў дзень, калі вывеў
іх з зямлі Эгіпецкай, з дому няволі, кажучы:
14 “Як пройдзе сем гадоў, вызваліце кожны брата свайго, Гебрая, які запрадаўся табе ў няволю
і служыў табе шэсьць гадоў, і пусьціце яго ад сябе вольным”. Але бацькі вашыя ня слухалі
Мяне і не прыхілілі [да гэтага] вуха свайго.
15 Вы навярнуліся сёньня і зрабілі тое, што справядлівае ў вачах Маіх, абвяшчаючы свабоду
кожны бліжняму свайму, і заключылі запавет перад абліччам Маім у Доме, у якім клічуць імя
Маё.
16 Але вы адступіліся і зьняважылі імя Маё, і вярнулі кожны нявольніка свайго і нявольніцу
сваю, якіх адпусьцілі вольнымі, [каб ішлі] паводле жаданьня свайго, і прымусілі іх, каб былі
для вас нявольнікамі і нявольніцамі.

17 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД. Вы не паслухалі Мяне, каб абвясьціць свабоду кожны брату
свайму і кожны бліжняму свайму. Вось, Я абвяшчаю вас свабоднымі, кажа ГОСПАД, [ісьці] пад
меч, заразу і голад, і Я аддам вас на страхоцьце для ўсіх валадарстваў зямлі.
18 І аддам тых людзей, якія парушылі запавет Мой, якія ня споўнілі словаў запавету, што
заключылі перад абліччам Маім, якія расьсеклі на дзьве [часткі] бычка і прайшлі паміж імі,
19 князёў Юды і князёў Ерусаліму, эўнухаў, сьвятароў і ўвесь народ зямлі гэтай, які праходзіць
паміж часткамі бычка [ахвярнага],
20 Я аддам у рукі ворагаў іхніх і ў рукі тых, якія шукаюць душу іхнюю. І стануцца трупы іхнія
пажываю для птушак нябесных і зьвяроў зямных.
21 А Сэдэкію, валадара Юды, і князёў ягоных Я аддам у рукі ворагаў іхніх, у рукі тых, якія
шукаюць душы іхняй, у рукі войска валадара Бабілонскага, якое [цяпер] адыйшло ад вас.
22 Вось, Я загадаю, кажа ГОСПАД, і прывяду іх зноў супраць гораду гэтага, і будуць яны ваяваць
супраць яго, і здабудуць яго, і спаляць агнём, і гарады Юды Я зраблю пусткаю, без жыхароў».

Яр 35

1 Слова, якое было Ярэміі ад ГОСПАДА ў дні Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, кажучы:
2 «Ідзі ў дом Рэхавічаў, і паразмаўляй з імі, і прывядзі іх у Дом ГОСПАДА ў адзін з пакояў, і дай
ім піць віно».
3 І я ўзяў Яазанію, сына Ярэміі, сына Хабацыніі, і братоў ягоных, і ўсіх сыноў ягоных, і ўвесь
дом Рэхавічаў,
4 і ўвёў іх у Дом ГОСПАДА, у пакой сыноў Ханана, сына Ігдаліі, чалавека Божага, які блізка
пакою князёў, над пакоем Маасэі, сына Шальлюма, які пільнаваў парог.
5 І я паставіў перад абліччам сыноў дому Рэхава начыньні, напоўненыя віном, і келіхі, і сказаў
ім: «Піце віно!»
6 А яны сказалі: «Ня будзем піць віна, бо Ёнадаў, сын Рэхава, бацька наш, загадаў нам, кажучы:
“Ня будзеце піць віна ані вы, ані сыны вашыя на вякі.
7 І ня будзеце вы будаваць дамоў, ня будзеце сеяць насеньне, ня будзеце садзіць вінаграднікі
і ня будзеце мець іх, але будзеце жыць у намётах усе дні вашыя, каб жылі вы шмат дзён на
абліччы зямлі, на якой вы вандруеце”.
8 І мы паслухаліся голасу Ёнадава, сына Рэхава, бацькі нашага, у-ва ўсім, што ён загадаў нам,
каб мы ня пілі віна ўсе дні нашыя, мы, жонкі нашыя, сыны нашыя і дочкі нашыя,
9 і каб мы не будавалі дамоў на пражываньне, і ня мелі ані вінаграднікаў, ані палёў, ані
насеньня.
10 І мы жывем у намётах, і мы паслухмяныя і ходзім паводле ўсяго, што загадаў нам Ёнадаў,
бацька наш.
11 І сталася, калі Навухаданосар, валадар Бабілонскі, напаў на зямлю гэтую, мы сказалі:
“Хадзем, схаваемся ў Ерусаліме перад войскам Халдэйскім і перад войскам Араму!” Імы
пасяліліся ў Ерусаліме».
12 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі, кажучы:
13 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Ідзі і скажы мужам Юды і жыхарам Ерусаліму:
“Ці вы не прынялі навучаньня, каб слухацца словаў Маіх? — кажа ГОСПАД.
14 Выкананыя словы Ёнадава, сына Рэхава, у якіх згадаў ён сынам ня піць віна, і яны ня п’юць
да дня сёньняшняга, бо яны паслухмяныя загаду бацькі свайго, а Я прамаўляў да вас, устаючы
ўначы і прамаўляючы, але вы не паслухалі Мяне!
15 І Я пасылаў да вас усіх слугаў Маіх, прарокаў, устаючы ўначы і пасылаючы, і кажучы:
"Адвярніцеся, прашу, кожны ад шляху свайго ліхога і выпраўце ўчынкі вашыя, і не хадзіце
за іншымі багамі, каб служыць ім, і будзеце жыць у зямлі, якую Я даў вам і бацькам вашым".
Але вы не прыхілілі вуха сваё і не паслухаліся Мяне.
16 Бо выканалі сыны Ёнадава, сына Рэхава, прыказаньне бацькі свайго, якое ён загадаў ім, а
народ гэты не паслухаўся Мяне!

17 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я навяду на Юду і на ўсіх
жыхароў Ерусаліму ўсялякае ліха, якое Я прамовіў супраць іх. Бо Я прамаўляў да іх, а яны
ня слухалі, і Я клікаў іх, а яны не адказвалі”».
18 А да дому Рэхавічаў сказаў Ярэмія: «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. За тое, што
вы былі паслухмянымі прыказаньню Ёнадава, бацькі вашага, і захоўваеце ўсе прыказаньні
ягоныя, і ходзіце паводле ўсяго, што ён загадаў вам,
19 дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Не застанецца Ёнадаў, сын Рэхава,
бяз мужа, які будзе стаяць перад абліччам Маім праз усе дні”».

Яр 36

1 І сталася ў чацьвёртым годзе Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, і было слова да Ярэміі ад
ГОСПАДА, кажучы:
2 «Вазьмі сабе скрутак кнігі і запішы на ім усе словы, якія Я прамовіў да цябе пра Ізраіль,
пра Юду і пра ўсе народы ад дня, калі Я [пачаў] прамаўляць да цябе, ад дзён Ёсіі аж да дня
сёньняшняга.
3 Можа, пачуе дом Юды пра ўсё ліха, якое Я маю намер учыніць ім, і адвернецца кожны ад
шляху свайго ліхога, і Я прабачу беззаконьні іхнія і грахі іхнія».
4 І паклікаў Ярэмія Баруха, сына Нэрыя, і напісаў Барух з вуснаў Ярэміі ў скрутку кнігі ўсе
словы ГОСПАДА, якія Ён прамовіў яму.
5 І загадаў Ярэмія Баруху, кажучы: «Мне забаронена і я не магу ўвайсьці ў Дом ГОСПАДА.
6 Таму пойдзеш ты і прачытаеш са скрутка словы ГОСПАДА, якія ты напісаў з вуснаў Маіх, у
вушы народу ў Доме ГОСПАДА ў дзень посту. Таксама ў вушы ўсяго Юды, які прыходзіць з
гарадоў сваіх, прачытаеш [гэта].
7 Можа, дойдзе маленьне іхняе перад аблічча ГОСПАДА, і яны адвернуцца ад шляху свайго
ліхога? Бо вялікі гнеў і лютасьць, пра якія прамовіў ГОСПАД народу гэтаму».
8 І Барух, сын Нэрыя, зрабіў усё, што загадаў яму Ярэмія прарок, каб прачытаў з кнігі словы
ГОСПАДА ў Доме ГОСПАДА.
9 І сталася ў пятым годзе Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, што ў дзявятым месяцы быў
аб’яўлены пост перад абліччам ГОСПАДА для ўсяго народу ў Ерусаліме і для ўсяго народу, які
прыходзіў з гарадоў Юды ў Ерусалім.
10 І прачытаў Барух з кнігі ў вушы народу словы Ярэміі ў Доме ГОСПАДА ў пакоі Гемарыі, сына
Шафана, пісара, на верхнім панадворку каля ўваходу ў Браму Новую Дома ГОСПАДА.
11 І пачуў Міхей, сын Гемарыі, сына Шафана, усе словы ГОСПАДА з кнігі.
12 І ён зыйшоў у дом валадара ў пакоі пісара. І вось, там сядзелі ўсе князі: Элішама, пісар, і
Дэлая, сын Шэмаі, і Эльнатан, сын Ахбора, і Гемарыя, сын Шафана, і Сэдэкія, сын Хананіі, і
іншыя князі.
13 І паведаміў ім Міхей усе словы, якія пачуў, калі Барух чытаў з кнігі ў вушы народу.
14 І паслалі ўсе князі да Баруха Егудыя, сына Нэтаніі, сына Шэлеміі, сына Кушы, кажучы:
«Вазьмі ў руку тваю скрутак, з якога ты чытаў у вушы народу, і прыходзь!» І ўзяў Барух, сын
Нэрыі, скрутак у руку сваю, і прыйшоў да іх.
15 І яны сказалі яму: «Сядзь, калі ласка, і прачытай гэта ў вушы нашыя». І прачытаў Барух
[словы] ў вушы іхнія.
16 І сталася, калі яны пачулі ўсе словы гэтыя, яны спалохаліся адзін перад адным і сказалі
Баруху: «Паведамляючы, паведамім валадару ўсе словы гэтыя».
17 І запыталі яны ў Баруха, кажучы: «Скажы, калі ласка, нам, як ты напісаў усе словы гэтыя з
вуснаў ягоных?»
18 І Барух сказаў ім: «Вуснамі сваімі ён дыктаваў мне ўсе словы гэтыя, а я запісваў іх
атрамантам у кнізе».
19 І сказалі князі Баруху: «Ідзі, схавайся, ты і Ярэмія, і няхай ніхто ня ведае, дзе вы».
20 І яны пайшлі да валадара на панадворак [палацу], а скрутак пакінулі ў пакоі пісара Элішамы,
і паведамілі ў вушы валадара.

21 І паслаў валадар Егудыя, каб прынёс скрутак. І Егудый узяў яго з пакоя Элішамы пісара, і
прачытаў яго ў вушы валадара і ў вушы ўсіх князёў, якія стаялі пры валадары.
22 А валадар сядзеў у доме зімовым у дзявятым месяцы, і перад абліччам ягоным [стаяла]
жарніца з распаленым [вугольлем].
23 І сталася, калі Егудый прачытваў тры ці чатыры слупкі, адразаў іх валадар сьцізорыкам
пісарскім і кідаў у агонь, які [быў] у жарніцы, пакуль увесь скрутак не згарэў у агні, які [быў]
у жарніцы.
24 І не спалохаліся, і не разьдзёрлі шатаў сваіх валадар і ўсе слугі ягоныя, якія слухалі ўсе словы
гэтыя.
25 І хоць Эльнатан, Дэлая і Гемарыя прасілі валадара не паліць скрутак, ён іх не паслухаў.
26 І загадаў валадар Ерахмээлю, сыну валадара, і Сэраі, сыну Азрыэля, і Шэлеміі, сыну Абдээля,
схапіць Баруха пісара і Ярэмію прарока, але ГОСПАД схаваў іх.
27 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі пасьля таго, як валадар спаліў скрутак са словамі, якія Барух
напісаў з вуснаў Ярэміі, кажучы:
28 «Павярніся і вазьмі сабе іншы скрутак, і напішы на ім усе словы папярэднія, якія былі ў
першым скрутку, які спаліў Егаякім, валадар Юды.
29 А пра Егаякіма, валадара Юды, скажаш: “Гэта кажа ГОСПАД. Ты спаліў скрутак гэты, кажучы:
"Навошта ты напісаў у ім, кажучы: “Прыходзячы, прыйдзе валадар Бабілонскі і зьнішчыць
зямлю гэтую, і вынішчыць з яе людзей і быдла”?"
30 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД пра Егаякіма, валадара Юды. Ня будзе ў яго таго, хто будзе
сядзець на пасадзе Давіда. Труп ягоны будзе выстаўлены на сьпёку ўдзень і на холад уначы.
31 І Я наведаю яго і насеньне ягонае, і слугаў ягоных за беззаконьні іхнія, і навяду на іх, і на
жыхароў Ерусаліму, і на мужоў Юды ўсё ліха, пра якое Я прамовіў да іх, а яны ня слухалі”».
32 І Ярэмія ўзяў іншы скрутак, і даў яго Баруху, сыну Нэрыі, пісару, і той напісаў на ім з вуснаў
Ярэміі ўсе словы кнігі, якую спаліў Егаякім, валадар Юды. І было дададзена да іх яшчэ шмат
падобных словаў.

Яр 37

1 І заваладарыў Сэдэкія, сын Ёсіі, замест Коніі, сына Егаякіма. Яго паставіў як валадара ў Юдзе
Навухаданосар, валадар Бабілонскі.
2 Але ані ён, ані слугі ягоныя, ані народ зямлі гэтай ня слухалі словаў ГОСПАДА, якія Ён
прамаўляў да іх праз рукі Ярэміі прарока.
3 І паслаў валадар Сэдэкія Егухаля, сына Шэлеміі, і Сафонію, сына Маасэі, сьвятара, да Ярэміі
прарока, кажучы:
4 «Памаліся, прашу, за нас да ГОСПАДА, Бога нашага!» А Ярэмія [тады] хадзіў і выходзіў сярод
народу і ня быў яшчэ ўкінуты ў вязьніцу.
5 І войска фараона выйшла з Эгіпту, і пачулі вестку пра гэта Халдэйцы, якія аблягалі Ерусалім,
і адступілі ад Ерусаліму.
6 І было слова ад ГОСПАДА да Ярэміі прарока, кажучы:
7 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля. Так скажаце валадару Юды, які паслаў вас да Мяне шукаць
[параду]: “Вось, войска фараона сьпяшаецца вам на дапамогу. Яно вернецца ў зямлю сваю, у
Эгіпет.
8 І вернуцца Халдэйцы, і будуць ваяваць супраць гораду гэтага, і здабудуць яго, і спаляць яго
агнём”.
9 Гэта кажа ГОСПАД. Не ашуквайце душаў вашых, кажучы: “Адыходзячы, адыйдуць
Халдэйцы!”, бо яны не адыйдуць [ад вас].
10 Нават калі б вы пабілі ўсё войска Халдэйцаў, якія ваююць з вамі, і засталіся б з іх [толькі]
параненыя, і тады кожны з іх падымецца з намёту свайго, і яны спаляць горад гэты агнём».
11 І сталася, калі адступіла войска Халдэйцаў ад Ерусаліму ад аблічча войска фараона,
12 выйшаў Ярэмія з Ерусаліму, каб ісьці ў зямлю Бэн’яміна і там падзяліць [спадчыну] сярод
народу.

13 І калі ён быў пры браме Бэн’яміна, быў там начальнік варты на імя Ірыя, сын Шэлеміі, сына Хананіі, і ён схапіў Ярэмію прарока, кажучы: «Ты пераходзіш да Халдэйцаў».
14 І сказаў Ярэмія: «Хлусьня! Я не пераходжу да Халдэйцаў!» Але той ня слухаў яго. І схапіў Ірыя Ярэмію, і завёў яго да князёў.
15 І разгневаліся князі на Ярэмію, і білі яго, і ўкінулі ў вязьніцу ў доме Ёнатана пісара, бо з яго зрабілі вязьніцу.
16 І зыйшоў Ярэмія ў лёх, у сутарэньні, і быў там шмат дзён.
17 І паслаў валадар Сэдэкія, і прывялі яго, і пытаўся ў яго валадар таемна ў доме сваім, і сказаў: «Ці ты маеш слова ад ГОСПАДА?» І сказаў Ярэмія: «Маю». І сказаў [далей]: «Ты будзеш выдадзены ў руку валадара Бабілонскага».
18 І сказаў Ярэмія валадару Сэдэкіі: «Чым саграшыў я перад табою, і перад слугамі тваімі, і перад народам гэтым, што ўкінулі мяне ў вязьніцу?
19 Дзе прарокі вашыя, якія прарочылі вам, кажучы: “Ня прыйдзе валадар Бабілонскі супраць вас і супраць зямлі гэтай”?
20 І цяпер паслухай, прашу, гаспадару мой, валадар! Няхай маленьне маё прыйдзе, прашу, перад аблічча тваё! Не вяртай мяне ў дом Ёнатана пісара, і я не памру там».
21 І загадаў валадар Сэдэкія, і трымалі Ярэмію на панадворку вартоўні, і давалі яму штодзень па кавалку хлеба з вуліцы пекараў, пакуль ня скончыўся ўвесь хлеб у горадзе. І заставаўся Ярэмія на панадворку вартоўні.

Яр 38

1 І пачулі Шэфатыя, сын Матана, і Гедалія, сын Пашхура, і Юхаль, сын Шэлеміі, і Пашхур, сын Малькіі, слова, якое прамовіў Ярэмія да ўсяго народу, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД. Хто застанецца ў горадзе гэтым, памрэ ад мяча, голаду і заразы. А хто пяройдзе да Халдэйцаў, застанецца жыць, і будзе для яго душа ягоная, як здабыча, і будзе жыць.
3 Гэта кажа ГОСПАД. Горад гэты выдаваньнем будзе выдадзены ў рукі войска валадара Бабілонскага, і ён здабудзе яго».
4 І сказалі князі валадару: «Няхай памрэ, просім, чалавек гэты, бо ён аслабляе рукі ваяроў, якія засталіся ў горадзе гэтым, і рукі ўсяго народу, калі да іх прамаўляе падобныя словы. Бо чалавек гэты не шукае супакою для народу гэтага, але толькі ліха!»
5 І сказаў валадар Сэдэкія: «Вось, ён у руках вашых! Бо валадар ня можа нічога зрабіць супраць слова вашага».
6 І яны ўзялі Ярэмію, і ўкінулі яго ў яму Малькіі, сына валадара, якая [была] на панадворку вартоўні, і спусьцілі [туды] Ярэмію на вяроўках. А ў яме не [было] вады, але толькі балота; і загруз Ярэмія ў балоце.
7 І пачуў Эбэд-Мэлек з Кушу, адзін з эўнухаў, які быў у доме валадара, што Ярэмія ўкінуты ў яму, а валадар сядзеў у Браме Бэн’яміна.
8 І выйшаў Эбэд-Мэлек з дому валадара, і сказаў валадару, кажучы:
9 «Пане мой, валадару! Людзі гэтыя ўчынілі зло ў-ва ўсім, што зрабілі Ярэміі прароку, якога ўкінулі ў яму. І ён памрэ з голаду ў месцы гэтым, бо няма ўжо хлеба ў горадзе!»
10 І загадаў валадар Эбэд-Мэлеку з Кушу, кажучы: «Вазьмі ў руку тваю адсюль трыццаць чалавек і выцягні прарока Ярэмію з ямы перш, чым ён памрэ».
11 І Эбэд-Мэлек узяў людзей у руку сваю, і пайшоў у дом валадара пад скарбніцаю, і ўзяў адтуль падзёртую адзежу і зношаныя лахманы, і спусьціў іх на вяроўках да Ярэміі ў яму.
12 І сказаў Эбэд-Мэлек з Кушу Ярэміі: «Падлажы, прашу, сабе падзёртае адзеньне і зношаныя лахманы пад пахі рук тваіх і пад вяроўкі». І Ярэмія зрабіў гэтак.
13 І пацягнулі Ярэмію на вяроўках, і выцягнулі з ямы. І сядзеў Ярэмія на панадворку вартоўні.
14 І паслаў валадар Сэдэкія, і ўзяў Ярэмію прарока да сябе, да трэцяга ўваходу, які ў Доме ГОСПАДА. І сказаў валадар Ярэміі: «Спытаюся ў цябе пра адну рэч, і ты не схавай нічога ад мяне!»

15 І сказаў Ярэмія Сэдэкіі: «Калі я распавяду табе, ты, забіваючы, заб'еш мяне. А калі я дам
табе раду, ты не паслухаеш мяне».
16 І прысягнуў валадар Сэдэкія патаемна Ярэміі, кажучы: «Як жывы ГОСПАД, Які зрабіў нам
душу нашую, не заб'ю цябе, і ня выдам у рукі людзей, якія шукаюць душу тваю».
17 І сказаў Ярэмія Сэдэкіі: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Калі ты, выходзячы,
выйдзеш да князёў валадара Бабілонскага, будзе жыць душа твая, і горад гэты ня будзе
спалены агнём, і ты будзеш жыць, і дом твой.
18 А калі ня выйдзеш да князёў валадара Бабілонскага, тады горад гэты будзе выдадзены ў рукі
Халдэйцаў, і яны спаляць яго агнём, і сам ты не ўцячэш ад рукі іхняй».
19 І сказаў валадар Сэдэкія Ярэміі: «Я баюся людзей Юды, якія перайшлі да Халдэйцаў, каб яны
часам ня выдалі мяне ў рукі іхнія і каб тыя ня зьдзекваліся з мяне».
20 І сказаў Ярэмія: «Ня выдадуць. Паслухай, прашу, голаса ГОСПАДА [адносна таго], што я
кажу табе, і будзе табе добра, і будзе жыць душа твая.
21 А калі ты адмовішся выйсьці, вось слова, якое паказаў мне ГОСПАД.
22 І вось, усе жанчыны, якія засталіся ў доме валадара Юды, ведзеныя да князёў валадара
Бабілонскага, і яны галосяць: "Падманулі цябе і ашукалі цябе сябры твае; ногі твае ўгразьлі ў
балоце, а яны ўцяклі".
23 І ўсе жонкі твае і сыны твае будуць заведзены да Халдэйцаў, і ты не ўцячэш ад рук іхніх, бо
схопіць цябе рука валадара Бабілонскага, і горад гэты будзе спалены агнём».
24 І сказаў Сэдэкія Ярэміі: «Няхай ніхто ня ведае пра словы гэтыя, і ты не памрэш!
25 А калі пачуюць князі, што я гаварыў з табой, і прыйдуць яны да цябе, і скажуць: "Скажы
нам, што ты гаварыў да валадара? Нічога не хавай перад намі, і мы не заб'ем цябе! Дык што
табе гаварыў валадар?",
26 тады ты скажаш ім: "Я прынёс маленьне маё перад аблічча валадара, каб мяне не вярнулі ў
дом Ёнатана, каб я не памёр там"».
27 І прыйшлі да Ярэміі ўсе князі, і спыталіся яго. І ён адказаў ім паводле ўсіх тых словаў, якія
загадаў яму валадар, і яны моўчкі [адыйшлі] ад яго, бо не пачулі словаў тых.
28 І сядзеў Ярэмія на панадворку вартоўні аж да дня, калі быў здабыты Ерусалім. І сталася,
што быў здабыты Ерусалім.

Яр 39

1 У дзясятым годзе Сэдэкіі, валадара Юды, у дзясятым месяцы, прыйшоў Навухаданосар,
валадар Бабілонскі, і ўсё войска ягонае пад Ерусалім, і абляглі яго.
2 У адзінаццатым годзе Сэдэкіі, у чацьвёртым месяцы, у дзявяты [дзень] месяца быў зроблены
вылом у горад.
3 І ўвайшлі ўсе князі валадара Бабілонскага, і сталі каля Сярэдзіннай Брамы: Нэргал-Сарэцэр,
Самгар-Нэво, Сар-Сэхім, галоўны эўнух, Нэргал-Сарэцэр, галоўны маг, і ўся рэшта князёў
валадара Бабілонскага.
4 І сталася, калі ўбачыў гэта Сэдэкія, валадар Юды, і ўсе ваяры, яны ўцяклі, і выйшлі ноччу з
гораду па дарозе праз сад валадара, праз браму паміж двума мурамі, і выйшлі на шлях у Арабу.
5 І пагналася войска Халдэйскае за імі, і дагнала Сэдэкію ў стэпе Ерыхонскім. І ўзялі яго, і
прывялі яго да Навухаданосара, валадара Бабілонскага, у Рыўлю ў зямлі Хамат, і ён прамовіў
на яго прысуд [свой].
6 І забіў валадар Бабілонскі сыноў Сэдэкіі ў Рыўлі на вачах ягоных, і ўсіх магнатаў Юды забіў
валадар Бабілонскі.
7 І вырваў вочы Сэдэкіі, і закаваў яго ў кайданы мядзяныя, каб завесьці ў Бабілон.
8 І спалілі агнём Халдэйцы дом валадара і дамы народу, а муры Ерусаліму зруйнавалі.
9 А рэшту народу, якая засталася ў горадзе, і ўцекачоў, якія здаліся яму, і рэшту народу, якая
засталася, Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, выгнаў у Бабілон.

10 А частку людзей убогіх, якія ня мелі анічога, пакінуў Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў,
у зямлі Юды і даў ім вінаграднікі і палі ў той дзень.
11 І загадаў Навухаданосар, валадар Бабілонскі, адносна Ярэміі праз рукі Нэвузарадана,
начальніка целаахоўнікаў, кажучы:
12 «Вазьмі яго і зьвярні на яго вочы твае, і не рабі яму нічога благога, але паводле таго, што ён
будзе гаварыць табе, так зрабі яму».
13 І паслаў Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, і Нэвушазбан, галоўны эўнух, і Нэргал-
Сарэцэр, галоўны маг, і ўсе начальнікі валадара Бабілонскага,
14 і паслалі яны, і ўзялі Ярэмію з панадворку вартоўні, і далі яго Гедаліі, сыну Ахікама, сына
Шафана, каб той адпусьціў яго дадому, і ён жыў сярод народу.
15 І да Ярэміі было слова ГОСПАДА, калі быў ён яшчэ ўвязьнены на панадворку вартоўні,
кажучы:
16 «Ідзі і скажы Эбэд-Мэлеку з Кушу, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось,
Я выконваю словы Мае супраць гораду гэтага на ліха, а не на дабро. І яны зьдзяйсьняюцца
перад абліччам тваім у дзень гэты.
17 Але Я выратую цябе, кажа ГОСПАД, і ты ня будзеш выдадзены ў рукі людзей, якіх ты баішся.
18 Бо Я, выбаўляючы, выбаўлю цябе, і ты не ўпадзеш ад мяча, і будзе ў цябе душа твая, як
здабыча, бо ты спадзяваўся на Мяне, кажа ГОСПАД”».

Яр 40

1 Слова, якое было да Ярэміі ад ГОСПАДА пасьля таго, як вызваліў яго з Рамы Нэвузарадан,
начальнік целаахоўнікаў, калі ён узяў яго, а ён быў закуты ў кайданы сярод усіх выгнанцаў з
Ерусаліму і Юды, якія мелі быць выведзеныя ў Бабілон.
2 І ўзяў начальнік целаахоўнікаў Ярэмію, і сказаў яму: «ГОСПАД, Бог твой, прамовіў пра ліха
гэтае супраць месца гэтага.
3 І зьдзейсьніў, і зрабіў ГОСПАД, як прадказваў, бо вы саграшылі супраць ГОСПАДА і ня слухалі
голас Ягоны, і сталася з вамі такая рэч.
4 І цяпер вось, я вызваляю цябе сёньня з путаў, якія на руках тваіх. Калі добра ў вачах тваіх
ісьці са мною ў Бабілон, ідзі, і я скірую вочы мае на цябе. А калі дрэнна ў вачах тваіх ісьці са
мною ў Бабілон, заставайся. Глядзі, уся зямля перад абліччам тваім, куды добра і слушна ў
вачах тваіх ісьці, туды ідзі».
5 І калі ён яшчэ не павярнуўся, [сказаў]: «Вярніся да Гедаліі, сына Ахікама, сына Шафана, якога
валадар Бабілонскі прызначыў над гарадамі Юды, і жыві з ім сярод народу, або ідзі туды, куды
слушна ў вачах тваіх». І даў яму начальнік целаахоўнікаў харчоў і падарункі, і адпусьціў яго.
6 І пайшоў Ярэмія да Гедаліі, сына Ахікама, у Міцпу, і жыў з ім сярод народу, які застаўся ў
зямлі [Юды].
7 І пачулі ўсе князі войскаў, якія [былі] ў полі, яны самі і людзі іхнія, што валадар Бабілонскі
вызначыў над краем Гедалію, сына Ахікама, і што даручыў яму мужчынаў і жанчынаў, дзяцей
і ўбогіх зямлі, якія не былі выгнаныя ў Бабілон.
8 Тады яны прыйшлі да Гедаліі ў Міцпу: Ізмаэль, сын Нэтаніі, Ёханан і Ёнатан, сыны Карэаха,
Сэрая, сын Танхумэта, сыны Эфая з Нэтофы, Езанія, сын Маахіцяніна, яны самі і людзі іхнія.
9 І Гедалія, сын Ахікама, сына Шафана, запрысягнуў ім і людзям іхнім, кажучы: «Ня бойцеся
служыць Халдэйцам! Заставайцеся ў зямлі гэтай і служыце валадару Бабілонскаму, і будзе
вам добра.
10 А я вось, буду жыць у Міцпе, каб заступацца перад абліччам Халдэйцаў, якія прыйдуць да
нас, а вы зьбірайце віно, плады і алей, і складайце ў пасудзіны вашыя, і жывіце ў гарадах, якія
вы маеце на ўласнасьць».
11 І таксама ўсе Юдэі, якія [былі] ў Мааве і сярод сыноў Амона, і ў Эдоме, і ў-ва ўсіх землях,
пачулі, што валадар Бабілонскі пакінуў рэшту [людзей] у Юдзе і паставіў над імі Гедалію, сына
Ахікама, сына Шафана.

12 І вярнуліся ўсе жыхары Юдэі з усіх месцаў, у якія былі расьцярушаныя, і прыйшлі ў зямлю
Юды да Гедаліі ў Міцпу, і сабралі віно і пладоў вельмі багата.
13 А Ёханан, сын Карэаха, і ўсе князі войскаў, якія [былі] ў полі, прыйшлі да Гедаліі ў Міцпу
14 і сказалі яму: «Ці табе вядома, што Бааліс, валадар сыноў Амона, паслаў Ізмаэля, сына
Нэтаніі, каб забіць цябе?» Але не паверыў ім Гедалія, сын Ахікама.
15 А Ёханан, сын Карэаха, сказаў патаемна Гедаліі ў Міцпе, кажучы: «Я пайду і заб'ю Ізмаэля,
сына Нэтаніі, і ніхто ня будзе ведаць. Навошта ён мае забраць душу тваю, і ўсе Юдэі, якія зараз
сабраўшыся пры табе, расьцярушацца, і загіне рэшта Юды?»
16 І сказаў Гедалія, сын Ахікама, Ёханану, сыну Карэаха: «Не рабі гэтай рэчы, бо хлусьню ты
гаворыш пра Ізмаэля».

Яр 41

1 І сталася ў сёмым месяцы, прыйшоў Ізмаэль, сын Нэтаніі, сына Элішамы, з насеньня
валадарскага, і начальнікі валадара, і дзесяць чалавек з ім да Гедаліі, сына Ахікама, у Міцпу, і
елі там разам хлеб у Міцпе.
2 І ўстаў Ізмаэль, сын Нэтаніі, і дзесяць чалавек, якія былі з ім, і ўдарылі Гедалію, сына Ахікама,
сына Шафана. І забіў [Ізмаэль] таго, каго валадар Бабілонскі прызначыў [начальнікам] у зямлі
[Юды].
3 І забіў Ізмаэль усіх Юдэяў, якія былі з Гедаліем у Міцпе, і Халдэйцаў ваяроў, якія там былі.
4 І сталася на другі дзень пасьля забойства, калі яшчэ ніхто [пра гэта] ня ведаў,
5 прыйшлі людзі з Сыхему, з Шыло і Самарыі, восемдзясят чалавек з паголенымі бародамі,
разьдзёртымі шатамі і нарэзамі на целе, і ў руках іхніх [былі] ахвяры хлебныя і кадзіла, каб
прынесьці [гэта] ў Дом ГОСПАДА.
6 І выйшаў Ізмаэль, сын Нэтаніі, насустрач ім з Міцпы, а яны, ідучы, ішлі і плакалі. І сталася,
калі ён сустрэў іх, сказаў ім: «Ідзіце да Гедаліі, сына Ахікама!»
7 І сталася, калі ўвайшлі яны ў сярэдзіну горада, пазабіваў іх Ізмаэль, сын Нэтаніі, ён і людзі,
якія [былі] з ім, і [ўкінуў] іх у сярэдзіну ямы.
8 І знайшлося дзесяць чалавек сярод іх, і яны сказалі Ізмаэлю: «Не забівай нас, бо маем у полі
схаваныя запасы: пшаніцу, ячмень, алей і мёд». І ён спыніўся, і не забіў іх разам з братамі
іхнімі.
9 А яма, у якую Ізмаэль кідаў усе трупы людзей, якіх забіў разам з Гедаліем, [была] тою ямаю,
якую зрабіў валадар Аса супраць Баашы, валадара Ізраіля. Гэтую яму Ізмаэль, сын Нэтаніі,
запоўніў забітымі.
10 І паланіў Ізмаэль усю рэшту народу, які [быў] у Міцпе, і дочак валадара, і ўвесь народ, які
застаўся, якіх Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, даручыў Гедаліі, сыну Ахікама. І забраў
іх з сабою Ізмаэль, сын Нэтаніі, і адыйшоў, каб перайсьці да сыноў Амона.
11 І пачуў Ёханан, сын Карэаха, і ўсе князі войска, якія [былі] з ім, пра ўсё ліха, якое ўчыніў
Ізмаэль, сын Нэтаніі,
12 і сабралі яны ўсіх людзей, і пайшлі ваяваць з Ізмаэлем, сынам Нэтаніі. І знайшлі яны яго
пры водах вялікіх, якія ў Гібэоне.
13 І сталася, калі ўвесь народ, які быў з Ізмаэлем, убачыў Ёханана, сына Карэаха, і ўсіх князёў
войска, якія [былі] з ім, яны ўзрадаваліся,
14 і адвярнуўся ўвесь народ, якога вывеў Ізмаэль з Міцпы, і вярнуліся, і перайшлі да Ёханана,
сына Карэаха.
15 А Ізмаэль, сын Нэтаніі, уцёк з васьмёма людзьмі ад аблічча Ёханана і перайшоў да сыноў
Амона.
16 І ўзяў Ёханан, сын Карэаха, і ўсе князі войска, якія з ім, усю рэшту народу, якую вывеў
Ізмаэль, сын Нэтаніі, з Міцпы пасьля таго, як забіў Гедалію, сына Ахікама, ваяроў, жанчынаў,
дзяцей і эўнухаў, якіх [Ёханан] вярнуў з Гібэону,
17 і пайшлі яны, і затрымаліся ў Герут-Кімгаме, які блізка Бэтлеему, каб ісьці далей і
[перайсьці] ў Эгіпет

18 далей ад аблічча Халдэйцаў, бо яны баяліся іх, бо Ізмаэль, сын Нэтаніі, забіў Гедалію, сына
Ахікама, якога валадар Бабілонскі прызначыў над зямлёй [Юды].

Яр 42

1 І наблізіліся ўсе князі, і Ёханан, сын Карэаха, і Езанія, сын Гешаі, і ўвесь народ ад малога да
вялікага,
2 і сказалі Ярэміі прароку: «Няхай прыйдзе перад аблічча тваё просьба нашая! Маліся за нас
да ГОСПАДА, Бога твайго, за ўсю рэшту гэтую, бо засталося нас нямнога з вялікае лічбы, як
бачаць вочы твае.
3 І няхай ГОСПАД, Бог твой, пакажа нам шлях, якім маем ісьці, і тыя рэчы, якія мы маем
рабіць».
4 І сказаў ім Ярэмія прарок: «Я чую. Вось, я памалюся да ГОСПАДА, Бога вашага, паводле словаў
вашых, і кожнае слова, якое ГОСПАД адкажа вам, я паведамлю вам, і не схаваю перад вамі
[ніякага] слова».
5 А яны сказалі Ярэміі: «Няхай ГОСПАД будзе супраць нас сьведкам верным і праўдзівым, калі
мы ня будзем рабіць паводле ўсіх словаў, якія ГОСПАД, Бог твой, пашле табе для нас.
6 Ці будзе гэта добра, ці кепска, мы будзем слухацца голасу ГОСПАДА, Бога нашага, да Якога
мы пасылаем цябе, каб нам было добра, бо мы паслухаліся голасу ГОСПАДА, Бога нашага».
7 І сталася, калі скончыліся дзесяць дзён, было слова ГОСПАДА да Ярэміі.
8 І ён паклікаў Ёханана, сына Карэаха, і ўсіх князёў войска, якія былі з ім, і ўвесь народ ад
малога да вялікага,
9 і сказаў ім: «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля, да Якога вы паслалі мяне, каб я прынёс перад
аблічча Ягонае просьбу вашую.
10 Калі, жывучы, будзеце жыць далей у зямлі гэтай, Я адбудую вас, а ня зьнішчу, і насаджу вас,
а ня вырву, бо Я шкадую адносна ліха, якое Я зрабіў вам.
11 Ня бойцеся аблічча валадара Бабілонскага, аблічча якога вы баіцёся, не палохайцеся яго,
кажа ГОСПАД, бо Я з вамі, каб збавіць вас і вызваліць вас з рукі ягонай.
12 І Я дам вам літасьць, і ён зьлітуецца над вамі і верне вас у зямлю вашую.
13 А калі вы скажаце: “Ня будзем жыць у зямлі гэтай”, і ня будзеце слухацца голасу ГОСПАДА,
Бога вашага,
14 кажучы: “Не! Мы пойдзем у зямлю Эгіпецкую, дзе ня будзем бачыць вайны, і ня будзем
чуць голас рогу, і ня будзем прагнуць хлеба, і там будзем жыць”,
15 дык цяпер слухайце слова ГОСПАДА, рэшта Юды. Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля:
“Калі вы, зьвярнуўшы, зьвернеце абліччы вашыя, каб ісьці ў Эгіпет, і пойдзеце, каб там
пасяліцца,
16 станецца, што меч, якога вы баіцёся, дасягне вас там, у зямлі Эгіпецкай, і голад, якога вы
палохаецеся, будзе спадарожнічаць вам у Эгіпце, і там вы паўміраеце.
17 І станецца, што ўсе людзі, якія зьвярнулі абліччы свае, каб ісьці ў Эгіпет, каб там пасяліцца,
памруць ад мяча, голаду і заразы, і ніводзін з іх ня выратуецца і не ўцячэ ад ліха, якое Я спашлю
на іх”.
18 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Як выліўся гнеў Мой і абурэньне Маё на
жыхароў Ерусаліму, так будзе выліты гнеў Мой на вас, калі вы прыйдзеце ў Эгіпет. І станецеся
вы праклёнам, страхоцьцем, зьнявагаю і ганьбаю, і больш ня ўбачыце месца гэтага”.
19 Прамовіў да вас ГОСПАД, рэшта Юды: “Не ідзіце ў Эгіпет”. Ведаючы, ведайце, што я
перасьцярог вас сёньня.
20 Бо блукаючы, вы заблукалі ў душах вашых, бо вы паслалі мяне да ГОСПАДА, Бога вашага,
кажучы: “Маліся за нас да ГОСПАДА, Бога нашага, і паведамі нам усё, што скажа ГОСПАД, Бог
наш, і мы зробім [гэта]”.
21 І я паведаміў вам сёньня, але вы ня слухаеце голасу ГОСПАДА, Бога вашага, у-ва ўсім тым, з
чым Ён паслаў мяне да вас.
22 І цяпер, ведаючы, ведайце, што вы паўміраеце ад мяча, голаду і заразы ў месцы, куды хочаце
ісьці, каб там пасяліцца».

Яр 43

1 І сталася, калі Ярэмія скончыў прамаўляць да ўсяго народу ўсе словы ГОСПАДА, Бога іхняга,
якія паслаў да іх ГОСПАД, Бог іхні, усе словы гэтыя,
2 сказалі Азарыя, сын Гашаі, і Ёханан, сын Карэаха, і ўсе людзі дзёрзкія, кажучы да Ярэміі:
«Хлусьню ты гаворыш! Не пасылаў цябе ГОСПАД, Бог наш, кажучы: “Не ідзіце ў Эгіпет, каб
там пасяліцца!”
3 Бо Барух, сын Нэрыі, намовіў цябе супраць нас, каб выдаць нас у рукі Халдэйцаў, каб забіць
нас або выгнаць нас у Бабілон».
4 І Ёханан, сын Карэаха, і ўсе князі войска, і ўвесь народ не паслухалі голасу ГОСПАДА, каб
жыць у зямлі Юды.
5 І Ёханан, сын Карэаха, і ўсе князі войска ўзялі ўсю рэшту Юды, якія вярнуліся з усіх народаў,
куды былі выгнаныя, каб жыць у зямлі Юды,
6 мужчынаў, жанчынаў, дзяцей, дочак валадара і кожную душу, якую Нэвузарадан, начальнік
целаахоўнікаў, пакінуў разам з Гедаліем, сынам Ахікама, сынам Шафана, і Ярэмію прарока, і
Баруха, сына Нэрыі.
7 І пайшлі яны ў зямлю Эгіпецкую, бо не паслухаліся голасу ГОСПАДА, і прыйшлі ў Тахпанхэс.
8 І было слова ГОСПАДА да Ярэміі ў Тахпанхэсе, кажучы:
9 «Вазьмі ў рукі твае камяні вялікія і схавай іх у гліне цагельнай пры ўваходзе ў дом фараона
ў Тахпанхэсе на вачах мужоў Юдэйскіх.
10 І скажаш ім: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я пашлю і прывяду
Навухаданосара, валадара Бабілонскага, слугу Майго. І ён паставіць пасад свой на камянях
гэтых, якія Я схаваў, і ён расьцягне намёт свой над імі.
11 І ён прыйдзе, і ўдарыць зямлю Эгіпецкую, і хто прызначаны на сьмерць, [той пойдзе] на
сьмерць, хто ў палон, [той пойдзе] ў палон, хто пад меч, [той пойдзе] пад меч.
12 І ён падпаліць агонь у дамах багоў Эгіпецкіх, і спаліць іх, і возьме ў палон, і ачысьціць зямлю
Эгіпецкую, як чысьціць пастух адзеньне сваё, і выйдзе адтуль у супакоі.
13 І паломіць ён слупы Бэт-Шэмэшу, які ў зямлі Эгіпецкай, і дамы багоў Эгіпецкіх спаліць
агнём”».

Яр 44

1 Слова, якое было да Ярэміі адносна ўсіх Юдэяў, якія жылі ў зямлі Эгіпецкай, якія жылі ў
Мігдоле, у Тахпанхэсе, у Нофе і ў зямлі Патрос, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вы бачылі ўсё ліха, якое Я спаслаў на Ерусалім і
на ўсе гарады Юды. І вось, яны зруйнаваныя ў дзень гэты, і няма ў іх жыхароў
3 за ліхоту, якую яны ўчынілі, каб гнявіць Мяне, ходзячы кадзіць і служыць іншым багам, якіх
ня ведалі ані яны, ані вы, ані бацькі вашыя.
4 І Я пасылаў да вас усіх слугаў Маіх, прарокаў, устаючы ўначы і пасылаючы, і кажучы: “Не
рабіце, прашу, рэчаў, якія Я ненавіджу!”
5 Але яны ня слухалі, і не прыхілілі вушы свае, каб адвярнуцца ад ліхоты сваёй і каб не кадзіць
багам чужым.
6 І выліліся гнеў Мой і лютасьць Мая, і запалалі ў гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму, і сталіся
яны руінаю і пусткаю, як [гэта бачыце] сёньня.
7 І цяпер гэта кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Навошта вы чыніце зло вялікае душам
вашым, каб былі вынішчаныя ў вас пасярод Юды мужчыны, жанчыны, дзеці і немаўляты, каб
не засталося з вас рэшты?
8 Навошта вы гнявіце Мяне ўчынкамі рук вашых, калі кадзіце багам чужым у зямлі Эгіпецкай,
куды вы прыйшлі, каб там пасяліцца, каб былі вы зьнішчаныя і каб сталіся праклёнам і
пасьмешышчам для ўсіх народаў зямлі?
9 Ці вы забыліся пра ліхоту бацькоў вашых і ліхоту валадароў Юды, і ліхоту жонак іхніх, пра
ліхоту вашую і пра ліхоту жонак вашых, якую вы чынілі ў зямлі Юды і на вуліцах Ерусаліму?

10 Да дня сёньняшняга вы не ўпакорыліся, і не баіцёся, і ня ходзіце паводле Закону Майго і
прыказаньняў Маіх, якія Я даў вам перад абліччам вашым і перад абліччам бацькоў вашых.
11 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Вось, Я зьвярну аблічча Маё супраць
вас на зло, каб зьнішчыць усяго Юду.
12 І прыбяру рэшту Юды, якія зьвярнулі абліччы свае, каб ісьці ў зямлю Эгіпецкую, каб там
пасяліцца, і загінуць усе ў зямлі Эгіпецкай, і ўпадуць ад мяча і ад голаду, і загінуць ад малога
да вялікага, і паўміраюць ад мяча і ад голаду, і стануцца праклёнам, страхоцьцем, зьнявагаю
і ганьбаю.
13 І Я наведаю тых, якія жывуць у зямлі Эгіпецкай, як наведаў Ерусалім, мячом, голадам і
заразаю.
14 І ня будзе ўцекача і выратаванага з рэшты Юды, якія прыйшлі, каб пасяліцца ў зямлі
Эгіпецкай, каб [потым] вярнуцца ў зямлю Юды, куды яны прагнуць усёй душою вярнуцца і
жыць там. Але ня вернецца [ніхто], хіба [толькі] недабіткі».
15 І адказалі Ярэміі ўсе мужчыны, якія ведалі, што жонкі іхнія кадзяць багам чужым, і ўсе
жанчыны, якія стаялі ў царкве вялікай, і ўвесь народ, які жыў у зямлі Эгіпецкай у Патросе,
кажучы:
16 «Слова, якое ты прамаўляў да нас у імя ГОСПАДА, мы ня будзем слухаць ад цябе.
17 Бо, выконваючы, мы выканаем усе словы, якія выйшлі з вуснаў нашых, і будзем кадзіць
валадарцы неба, і будзем выліваць для яе ахвяры вадкія, як рабілі мы, і бацькі нашыя,
валадары нашыя і князі нашыя ў гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму, і мы былі насычаны
хлебам, і было нам добра, і ліха мы ня бачылі.
18 Але з таго часу, калі мы перасталі кадзіць валадарцы неба і выліваць для яе ахвяры вадкія,
бракуе нам усяго, і мы гінем ад мяча і голаду».
19 [А жанчыны казалі]: «Калі мы кадзім валадарцы неба і калі выліваем для яе ахвяры вадкія,
хіба [робім гэта] бяз [згоды] мужоў нашых, ці робім для яе печыва з вобразам ейным і
выліваем ахвяры вадкія?»
20 І сказаў Ярэмія ўсяму народу, мужчынам, жанчынам і ўсім людзям, якія адказалі яму
[такім] словам, кажучы:
21 «Хіба тое кадзіла, якое вы палілі ў гарадах Юды і на вуліцах Ерусаліму, вы і бацькі вашыя,
валадары вашыя і князі вашыя, і народ зямлі, князі і просты народ, [хіба] ГОСПАД ня памятае
яго і не ўвайшло яно ў сэрца Ягонае?
22 І ня мог ГОСПАД больш зносіць ліхоцьце ўчынкаў вашых і брыдоты, якія вы чынілі. І сталася
зямля вашая руінаю, пустэчаю і праклёнам, без жыхароў, як [бачыце гэта] сёньня.
23 За тое, што вы кадзілі і што грашылі супраць ГОСПАДА, і ня слухалі голасу ГОСПАДА, і
не хадзілі паводле Закону Ягонага, паводле прыказаньняў Ягоных і паводле сьведчаньняў
Ягоных, спаткала вас гэткае ліха, як [бачыце гэта] сёньня».
24 І сказаў Ярэмія ўсяму народу і ўсім жанчынам: «Слухайце слова ГОСПАДА, увесь Юда, які ў
зямлі Эгіпецкай!
25 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, кажучы: “Вы і жонкі вашыя прамаўляеце вуснамі
вашымі і робіце рукамі вашымі, кажучы: "Выконваючы, выканаем шлюбаваньні нашыя, якія
мы абяцалі, каб кадзіць для валадаркі неба і выліваць для яе ахвяры вадкія". Выконваючы,
выконвайце шлюбаваньні вашыя і, зьдзяйсьняючы, зьдзяйсьняйце абяцаньні вашыя!”
26 Дзеля гэтага паслухай слова ГОСПАДА, ты, увесь Юда, які жыве ў зямлі Эгіпецкай. Вось, Я
прысягаю на імя Маё вялікае, кажа ГОСПАД, што ў-ва ўсёй зямлі Эгіпецкай ня будзе больш
клікаць імя Маё вуснамі [сваімі] ніхто з мужоў Юды, кажучы: “Як жывы Госпад ГОСПАД!”
27 Вось, Я чуваю над вамі на зло, а не на дабро. І загінуць усе мужы Юды, якія ў зямлі Эгіпецкай,
ад мяча і голаду аж да зьнішчэньня іх.
28 Тыя, што ўратуюцца ад мяча, вернуцца з зямлі Эгіпецкай у зямлю Юды ў малой лічбе, і
даведаецца ўся рэшта Юды, якія прыйшлі ў зямлю Эгіпецкую, каб пасяліцца там, чыё слова
зьдзейсьніцца, Маё ці іхняе.
29 І гэта будзе для вас знакам, кажа ГОСПАД, што Я наведаю вас у месцы гэтым, каб вы
даведаліся, што спаўняючыся, споўняцца словы Мае пра вас на зло.

30 Гэта кажа ГОСПАД: “Вось, Я аддам фараона Хофру, валадара Эгіпецкага, у рукі ворагаў
ягоных і рукі тых, якія шукаюць душы ягонай, як Я аддаў Сэдэкію, валадара Юды, у рукі
Навухаданосара, валадара Бабілонскага, ворага ягонага, які шукаў душу ягоную”».

Яр 45

1 Слова, якое прамовіў Ярэмія прарок да Баруха, сына Нэрыі, калі ён запісаў словы гэтыя ў
кнігу з вуснаў Ярэміі ў чацьвёртым годзе Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля, да цябе, Барух.
3 Ты кажаш: “Гора мне, бо ГОСПАД дадае смутку да болю майго. Я змучыўся ад уздыханьняў,
не знаходжу супачыну!”
4 Так скажаш яму: “Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я руйную тое, што пабудаваў, а тое, што пасадзіў,
вырываю, усю зямлю гэтую.
5 А ты шукаеш для сябе вялікага? Не шукай! Бо вось, Я прыводжу ліха на кожнае цела, кажа
ГОСПАД, а табе дам душу тваю як здабычу ў кожным месцы, куды ты пойдзеш”».

Яр 46

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Ярэміі прарока пра народы.
2 Супраць Эгіпту, супраць войска фараона Нэхо, валадара Эгіпецкага, якое было каля ракі
Эўфрат у Каркемішы і якое пабіў Навухаданосар, валадар Бабілонскі, у чацьвёртым годзе
Егаякіма, сына Ёсіі, валадара Юды:
3 «Падрыхтуйце тарчу і шчыт і ідзіце ў бой!
4 Запрагайце коней і сядайце, вершнікі, і пашыхтуйцеся [тыя, што] ў шаломах, навастрыце
дзіды і апраніце панцыры!
5 Што я бачу? Яны напалоханыя, адыходзяць, і волаты іхнія пабітыя, уцякаюць у страху і не
аглядаюцца! Жах вакол, кажа ГОСПАД.
6 Не ўцячэ хуткі і ня выратуецца волат. На поўначы, на беразе ракі Эўфрат спатыкаюцца яны і
падаюць.
7 Хто той, які падымаецца як рака, воды ягоныя хвалююцца як ручай?
8 Эгіпет падымаецца як рака, і воды ягоныя хвалююцца як ручай, і ён кажа: “Падняўшыся,
пакрыю зямлю, зьнішчу горад і жыхароў ягоных”.
9 Імчыце, коні, ляціце, калясьніцы, і ідзіце наперад, волаты. Куш і Пут няхай трымаюць шчыты,
і Людыйцы няхай нацягваюць лук!
10 Гэта дзень Госпада, ГОСПАДА Магуцьцяў, дзень помсты, каб адпомсьціць ворагам Ягоным. І
меч будзе есьці, і насыціцца, і нап’ецца крыві, бо гэта ахвяра для Госпада, ГОСПАДА Магуцьцяў,
у зямлі паўночнай каля ракі Эўфрат.
11 Пайдзі ў Гілеад і вазьмі бальзам, дзяўчына, дачка Эгіпту! Надарма, памнажаючы, ты
памнажаеш лекі, няма аздараўленьня для цябе!
12 Пачулі народы пра ганьбу тваю, і галашэньне тваё напоўніла зямлю, бо волат спатыкнуўся
аб волата, і абодва ўпалі разам».
13 Слова, якое прамовіў ГОСПАД да Ярэміі прарока пра прыйсьце Навухаданосара, валадара
Бабілонскага, каб захапіць зямлю Эгіпецкую:
14 «Паведаміце Эгіпту і паслухайце ў Мігдоле, паслухайце ў Нофе і Тахпанхэсе! Скажыце:
“Стань і рыхтуйся, бо меч праглыне [ўсё] вакол цябе”.
15 Чаму ўпаў асілак твой? Не ўстаяў ён, бо ГОСПАД штурхнуў яго.
16 Моцна захістаўся і ўпаў чалавек на бліжняга свайго, і сказаў: “Падыміся і вернемся да
народу нашага і ў зямлю нараджэньня нашага ад аблічча мяча забойчага”.
17 Назавіце фараона, валадара Эгіпецкага, “Гармідар”, ён прапусьціў час адпаведны.
18 Як жывы Я, кажа Валадар, ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае, як Табор сярод гор і як Кармэль
пры моры, прыйдзе ён.
19 Падрыхтуй рэчы на выгнаньне, жыхарка, дачка Эгіпту, бо Ноф стане пустэчаю, і будзе
спалены, без жыхароў.

20 Эгіпет — цялушка ладная, прыгожая, але авадзень з поўначы прыходзіць, прыходзіць.
21 Найміты ягоныя пасярод яго як цяляты кормныя, але і яны вярнуліся і ўцяклі разам, ня
вытрымалі, бо прыйшоў на іх дзень загубы іхняй, час наведваньня іхняга.
22 Голас [Эгіпту] загучыць як [сычэньне] зьмяі, бо набліжаюцца з войскамі, і прыйдуць да яго
з сякерамі, як дрывасекі.
23 І сьсякуць яны лес ягоны, кажа ГОСПАД, хоць ён непраходны, бо іх больш ад саранчы, і няма
ім ліку.
24 Асаромлена дачка Эгіпту і аддадзена ў рукі народу паўночнага.
25 Кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Вось, Я наведаю Амона ў Но, і фараона, і Эгіпет, і
багоў ягоных, і валадароў ягоных, і фараона, і тых, якія спадзяюцца на яго.
26 І аддам іх у рукі тых, якія шукаюць душу іхнюю, у рукі Навухаданосара, валадара
Бабілонскага, і ў рукі слугаў ягоных, але потым ён будзе абжыты як у дні старадаўнія, кажа
ГОСПАД.
27 А ты ня бойся, слуга Мой Якуб, і не палохайся, Ізраіль, бо вось, Я збаўлю цябе з [зямлі]
далёкай, і насеньне тваё — з зямлі палону іхняга. І вернецца Якуб, і супачыне, і будзе ў
бясьпецы, і ніхто ня будзе трывожыць [яго]!
28 Ты ня бойся, слуга Мой, Якуб, кажа ГОСПАД, бо Я з табою, бо Я зраблю канец усім народам,
у якіх Я расьцярушыў цябе, а табе не зраблю канец, але пакараю цябе паводле правасудзьдзя,
і непакараным не пакіну цябе”».

Яр 47

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Ярэміі прарока адносна Філістынцаў, перш, чым фараон здабыў
Газу:
2 «Гэта кажа ГОСПАД. Вось, воды падымаюцца з поўначы, і будуць яны як ручай залеўны, і
зальюць зямлю і ўсё, што на ёй, горад і жыхароў у ім, і будуць крычаць людзі, і загалосяць усе
жыхары зямлі.
3 Ад тупату капытоў дужых [коней] ягоных, ад лязгату калясьніцаў ягоных і грукату колаў
іхніх бацькі ня зьвернуцца да сыноў, бо самлеюць [ім] рукі,
4 бо надыйшоў дзень, каб зьнішчыць усіх Філістынцаў, каб выгубіць у Тыры і Сідоне ўсіх
памочнікаў, якія засталіся. Бо ГОСПАД зьнішчыць Філістынцаў і рэшту вострава Кафтор.
5 Аблысела Газа, зьнямеў Ашкелён. Рэшта даліны іхняй, як доўга будзеце рабіць сабе нарэзы?
6 Гора! Меч ГОСПАДА, як доўга ты не супачынеш? Вярніся ў похвы свае, супакойся і суцішся!
7 Але як ён супакоіцца, калі ГОСПАД загадаў яму, супраць Ашкелёну і супраць узьбярэжжа
мора скіраваў яго».

Яр 48

1 Адносна Мааву. «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля. Гора Нэво, бо ён зьнішчаны, і
Кірыятаім асаромлены і здабыты, асаромлены замак і напалоханы.
2 Няма больш славы ў Мааве! У Хешбоне задумляюць ліхоту супраць яго: “Хадзем, выгубім
яго спаміж народаў”. Таксама ты, Мадмэн, замоўкнеш, за табою прыйдзе меч.
3 Голас крыку з Харанаіму: “Спусташэньне і бяда вялікая”.
4 Мааў пераможаны! Чуваць крык аж да Цаару.
5 Праз вандол у Люхіт узыходзяць, плачучы, на схіле Харанаіму чутна галашэньне пра загубу:
6 “Уцякайце! Ратуйце душы вашыя і будзеце як той верас у пустыні”.
7 За тое, што ты спадзяваўся на справы твае і на скарбы твае, ты таксама будзеш здабыты, і
Кемош пойдзе на выгнаньне, і разам [з ім] сьвятары ягоныя і князі ягоныя.
8 І прыйдзе руйнаваньне ў кожны горад, і [ніводзін] горад не ўратуецца, і загіне даліна, і будзе
зьнішчана раўніна, бо [гэта] сказаў ГОСПАД.
9 Дайце крылы Мааву, і ён паляціць, і гарады ягоныя стануцца пустэчаю, і ня будзе жыхароў у
іх.

10 Пракляты, хто выконвае справу ГОСПАДА нядбала! Пракляты, хто меч Ягоны стрымлівае ад
крыві!
11 Мааў цешыўся супакоем ад юнацтва свайго і адпачываў спакойна на дражджах сваіх, і ня
быў пераліваны з пасудзіны ў пасудзіну, і не ішоў на выгнаньне. Таму захаваў ён смак свой, і
пах ягоны не зьмяніўся.
12 Дзеля гэтага вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я пашлю да яго тых, якія наліваюць
[віно], і яны пераль́юць яго, і посуд ягоны спустошаць, і збаны ягоныя патаўкуць.
13 І будзе саромецца Мааў дзеля Кемоша, як дом Ізраіля саромеўся дзеля Бэтэлю, на які
спадзяваўся.
14 Як вы [можаце] казаць: “Мы — волаты і ваяры ў бітве”?
15 Той, хто зьнішчыць Мааў і гарады ягоныя, прыходзіць, і найлепшыя юнакі ягоныя пойдуць
на зарэз, кажа Валадар, ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае.
16 Набліжаецца загуба Мааву, вельмі сьпяшаецца бяда ягоная.
17 Спачувайце яму, усе, хто навокал яго, і ўсе, якія ведаеце імя ягонае, і кажыце: “Як зламаны
скіпетр моцны, кій слаўны!”
18 Зыйдзі са славы сваёй і сядзь у сухой [зямлі], дачка Дыбону, бо прыйшоў да цябе нішчыцель
Мааву, і ён зруйнуе цьвярдыні твае.
19 Стань каля дарогі і глядзі, жыхарка Араэру, і пытайся таго, хто ўцёк, і таго, хто ўратаваўся,
і кажы: “Што сталася?”
20 Мааў асаромлены, бо зламаны. Крычыце і галасіце, і паведамце ў Арноне, што спустошаны
Мааў.
21 Прыходзіць суд на зямлю раўнінную, на Халён, на Ягцу, на Мэфаат,
22 на Дыбон, на Нэво, на Бэт-Дыблатаім,
23 на Кірыятаім, на Бэт-Гамуль, на Бэт-Мэон,
24 на Керыёт, на Боцру і на ўсе гарады зямлі Мааў, далёкія і блізкія.
25 Адсечаны рог Мааву, і зломлена рамяно ягонае, кажа ГОСПАД.
26 Напаіце яго, бо ён узьвялічваўся супраць ГОСПАДА, і няхай паваліцца Мааў у ванітаваньні
свае і станецца пасьмешышчам.
27 Ці ня быў для цябе пасьмешышчам Ізраіль? Хіба ён знойдзены сярод злодзеяў, што ты
ківаеш галавою, калі пра яго гаворыш?
28 Пакідайце гарады і жывіце сярод скалаў, жыхары Мааву, і будзьце як голуб, які віе гняздо
на збоччах на краі стромы.
29 Мы чулі пра пыхлівасьць Мааву, ганарыстасьць вялікую, пра фанабэрыстасьць ягоную і пра
зухвальства ягонае, пра пыхлівасьць ягоную і надзьмутасьць сэрца ягонага.
30 Я ведаю, кажа ГОСПАД, дзёрзкасьць ягоную, і што пустая пахвальба ягоная, і нявартае тое,
што робяць яны.
31 Дзеля таго Я галашу дзеля Мааву, і дзеля ўсяго Мааву лямантую, і бядую дзеля людзей Кір-
Хэрэсу.
32 Больш, чым дзеля Язэру, Я плачу дзеля цябе, вінаграднік Сібмы! Парасткі твае дайшлі аж
да мора і сягаюць аж да мора Язэру, але напаў нішчыцель на сьпелы плод твой і на вінаград
твой.
33 І забраныя радасьць і пацеха з вінаградніку і з зямлі Мааў, і Я скончу віно ў тоўчнях, [ніхто]
яго не выціскае з радаснай песьняй, і радасная песьня [ўжо] ня радасная песьня.
34 Ад крыку з Хешбону аж да Элеале, аж да Ягацу даходзіць голас іхні, ад Цаару да Харанаіму і
да Эглят-Шэлішыі, бо нават воды Німрыму стануць сухой [зямлёю].
35 Я выгублю ў Мааве, кажа ГОСПАД, таго, хто ўзыходзіць на ўзгоркі і кадзіць багам сваім.
36 Дзеля гэтага сэрца Маё дзеля Мааву як жалейка стогне, і дзеля людзей Кір-Хэрэсу як
жалейка стогне, бо ўсё, што яны сабралі, прапала.
37 Бо кожная галава аблысела, і кожная барада абголена, на ўсіх руках — нарэзы, і на сьцёгнах
— зрэбніца.

38 На ўсіх дахах Мааву і на плошчах ягоных лямант вялікі, бо Я раструшчыў Мааў, як посуд
[гліняны], які не падабаецца, кажа ГОСПАД.
39 Які ён раструшчаны! Галасіце! Як Мааў уцякаў асаромлены! І стаўся Мааў пасьмешышчам
і страхоцьцем для ўсіх навокал.
40 Бо гэта кажа ГОСПАД. Вось, ён прыляціць, як арол, і раскіне крылы свае над Маавам.
41 Керыёт будзе здабыты, і крэпасьці захопленыя. І будзе сэрца волатаў Мааву ў той дзень, як
сэрца жанчыны, якая нараджае.
42 І будзе зьнішчаны Мааў як народ, бо ўзьвялічваўся супраць ГОСПАДА.
43 Жах, яма і пастка для цябе, жыхар Мааву, кажа ГОСПАД.
44 Хто ўцячэ ад жаху, упадзе ў яму, а хто вылезе з ямы, будзе схоплены ў пастку, бо Я прывяду
на Мааў год наведваньня іхняга, кажа ГОСПАД.
45 У ценю Хешбону стануць зьнясіленыя ўцекачы, але агонь выйдзе з Хешбону, і полымя — з
сярэдзіны Сыгону, і праглыне бакі Мааву і цемя сыноў бунту.
46 Гора табе, Мааў! Загінуў народ Кемоша, бо сыны твае ўзятыя ў палон, і дочкі твае — у няволі.
47 Але Я вярну палонных Мааву ў будучыя дні, кажа ГОСПАД. Аж дасюль суд над Маавам».

Яр 49

1 Адносна сыноў Амона. «Гэта кажа ГОСПАД. Хіба няма сыноў у Ізраіля? Хіба няма ў яго
спадкаемцы? Навошта Мільком узяў спадчыну Гада, і народ ягоны жыве ў гарадах іхніх?
2 Дзеля гэтага надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і пачуюць гармідар ваенны ў Раббе сыноў
Амона, і яна станецца руінаю і пусткаю, і дочкі ейныя будуць спаленыя агнём. І ўспадкаеміць
Ізраіль спадчыну сваю, кажа ГОСПАД.
3 Галасі, Хешбон, бо зруйнаваны Гай! Лямантуйце, дочкі Раббы, апраніцеся ў зрэбніцу,
галасіце і бегайце кругом муроў, бо Мільком пойдзе ў няволю разам са сьвятарамі ягонымі
і князямі ягонымі.
4 Чаго ты хвалішся далінамі сваімі? Расьцяклася даліна твая, дачка няверная. Ты спадзявалася
на скарбы твае [і казала]: “Хто прыйдзе да мяне?”
5 Вось, Я прывяду на цябе страх, кажа Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, ад усіх, хто вакол цябе, і вы
паўцякаеце, кожны ў свой бок, і ня будзе каму зьбіраць уцекачоў.
6 Але потым Я вярну палонных сыноў Амона, кажа ГОСПАД».
7 Адносна Эдому. «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Ці ўжо больш няма мудрасьці ў Тэмане?
Хіба спынілася рада разумных, і непатрэбнай сталася мудрасць іхняя?
8 Уцякайце, бяжыце назад, хавайцеся ў ямы, жыхары Дэдану, бо Я прывёў загубу Эзава на яго,
час, калі наведваю яго.
9 Калі зьбіральнікі вінаграду прыйдуць да цябе, яны не пакінуць недазьбіранага, і калі злодзеі
[прыйдуць] уначы, яны панішчаць, колькі хочуць.
10 Бо Я агалю Эзава, адкрыю сховы ягоныя, нічога ён схаваць ня зможа. Зьнішчана будзе
насеньне ягонае, і браты ягоныя, і суседзі ягоныя, і ня будзе яго.
11 Пакінь сіротаў тваіх, Я ўтрымаю [іх] пры жыцьці, і ўдовы твае няхай спадзяюцца на Мяне.
12 Бо гэта кажа ГОСПАД: “Вось, тыя, якім не прысуджана піць келіх [гэты], п’ючы, будуць піць,
а ты як застанешся непакараным? Ня будзеш непакараным, але п’ючы, будзеш піць [келіх
гэты]”.
13 Прысягаю на Самога Сябе, кажа ГОСПАД, што Боцра станецца спусташэньнем, і ганьбаю, і
пустэчаю, і праклёнам, і ўсе гарады ейныя стануцца руінамі на вякі.
14 Я пачуў вестку ад ГОСПАДА, і весьнік пасланы да народаў: “Зьбірайцеся і ідзіце на яго!
Падрыхтуйцеся да бою!”
15 Бо вось, Я зраблю цябе малым сярод народаў, пагарджаным між людзьмі.
16 Падманула цябе фанабэрыя твая і пыхлівасьць сэрца твайго, цябе, які жывеш у пячорах
скальных і трымаешся ўзгоркаў высокіх. Бо хоць ты высока зьвіў гняздо сабе, як арол, Я і
адтуль скіну цябе, кажа ГОСПАД.

17 Эдом станецца пустэчай, і кожны, хто будзе праходзіць праз яго, аслупянее і засьвішча дзеля
ўсіх ранаў ягоных.
18 Як пасьля зьнішчэньня Садому і Гаморы і суседзяў іхніх, кажа ГОСПАД, ня будзе жыць там
чалавек, і не паселіцца там сын чалавечы.
19 Вось, ён выходзіць як леў з гушчара над Ярданам на паплавы зялёныя. Я ў момант змушу яго
ўцякаць ад іх, а выбранага юнака пастаўлю над імі. Бо хто [падобны] да Мяне, або хто пакліча
Мяне [на суд]? І які пастыр устаіць перад абліччам Маім?
20 Дзеля гэтага паслухайце пра намер ГОСПАДА, які Ён мае адносна Эдому, і думкі Ягоныя, якія
Ён мае адносна жыхароў Тэману. Выцягнуць нават найменшых авечак, і будуць спустошаны
пашы іхнія.
21 Ад гуку зьнішчэньня іхняга задрыжыць зямля, і крык будзе чутны над Морам Чырвоным.
22 Вось, як арол, падымаецца ён, і ўзьлятае, і раскідвае крылы свае над Боцраю, і сэрца волатаў
Эдому ў той дзень станецца як сэрца жанчыны, якая нараджае».
23 Адносна Дамаску. «Асаромеюцца Хамат і Арпад, бо пачулі яны вестку ліхую, і трывожацца
яны, як мора, якое супакоіцца ня можа.
24 Аслабеў Дамаск, павярнуўся, каб уцякаць, ахапіў яго страх, мучэньні і болі апанавалі яго як
жанчыну, якая нараджае.
25 Як ты спустошаны, горад слаўны, горад вясёласьці?
26 Таму ўпадуць юнакі ягоныя на плошчах ягоных, і ўсе ваяры змоўкнуць у той дзень, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў.
27 І Я распалю агонь на мурах Дамаску, і ён спаліць палацы Бэн-Гадада».
28 Адносна Кедару і валадарства Хацор, якія пабіў Навухаданосар, валадар Бабілонскі. «Гэта
кажа ГОСПАД: “Устаньце, ідзіце на Кедар і нішчыце сыноў Усходу!”
29 Забяруць намёты іхнія і авечак іхніх, і накрыцьці іхнія, і ўсе начыньні іхнія, павядуць
вярблюдаў іхніх сабе і будуць крычаць на іх: “Жах навокал”.
30 Уцякайце, выходзьце хутчэй, хавайцеся ў ямы, жыхары Хацору, кажа ГОСПАД, бо супраць
вас радзіць раду Навухаданосар, валадар Бабілонскі, і задумаў супраць вас намер.
31 “Устаньце і ідзіце на народ спакойны, які жыве бясьпечна, кажа ГОСПАД, няма ў іх брамаў,
і няма засавак, і жывуць яны самотна”.
32 І стануцца вярблюды іхнія здабычаю, а мноства чародаў іхніх — на рабунак. І Я расьцярушу
іх на ўсе вятры, тых, якія падразаюць [валасы] на скронях, і з усіх бакоў прывяду загубу на іх,
кажа ГОСПАД.
33 І станецца Хацор прыстанішчам цмокаў і пусткаю на вякі. Ня будзе жыць там чалавек, і не
паселіцца там сын чалавечы».
34 Слова ГОСПАДА, якое было да Ярэміі прарока адносна Эляму на пачатку валадараньня
Сэдэкіі, валадара Юды, кажучы:
35 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Вось, Я зламлю лук Эляму, пачатак сілы ягонай.
36 І прывяду на Элям чатыры вятры з чатырох канцоў неба, і расьцярушу іх на ўсе вятры гэтыя.
І ня будзе такога народу, да якога ня прыйдуць выгнанцы з Эляму.
37 І Я напужаю Элям перад абліччам ворагаў іхніх і перад абліччам тых, якія шукаюць душу
іхнюю. І прывяду на іх ліха і лютасьць гневу Майго, кажа ГОСПАД, і пашлю за імі меч, пакуль
ня [вынішчу] іх да канца.
38 І Я пастаўлю пасад Мой у Эляме, і выкіну адтуль валадара і князёў, кажа ГОСПАД.
39 Але будзе ў будучых днях, Я вярну палонных Эляму, кажа ГОСПАД».

Яр 50

1 Слова, якое прамовіў ГОСПАД пра Бабілон і пра зямлю Халдэйскую праз рукі Ярэміі прарока:
2 «Паведаміце сярод народаў і абвяшчайце, узьніміце сьцяг, абвяшчайце, не хавайце, кажыце:
“Здабыты Бабілон! Асаромлены Бэль! Зламаны Мэрадах! Асаромлены балваны іхнія,
паразьбіваныя ідалы іхнія!”
3 Бо ідзе супраць яго народ з поўначы. Ён пераменіць зямлю іхнюю ў пустэчу, і ніхто ня будзе
жыць у ёй, ад чалавека да жывёлы, [усе] ўцякуць і адыйдуць [адтуль].

4 У тыя дні і ў той час, кажа ГОСПАД, прыйдуць сыны Ізраіля разам з сынамі Юды, ідучы і
плачучы, і пойдуць, і будуць шукаць ГОСПАДА, Бога свайго.
5 Яны будуць пытацца пра шлях на Сыён, і [зьвернуць] абліччы свае да яго: “Хадземце,
злучымся з ГОСПАДАМ запаветам вечным, якога не забудзем”.
6 Народ Мой як авечкі заблуканыя, пастыры іхнія завялі іх бадзяцца па гарах; ад гары да
ўзгорку яны хадзілі, і забыліся пра месца адпачынку свайго.
7 Усе, якія знаходзілі іх, зьядалі іх, і прыгнятальнікі іхнія казалі: “Не вінававтыя мы, бо яны
саграшылі супраць ГОСПАДА, Пашы праведнасьці і надзеі бацькоў іхніх, ГОСПАДА”.
8 Уцякайце з Бабілону, выходзьце з зямлі Халдэйскай, і будзьце як казлы перад авечкамі.
9 Бо вось, Я абуджу і прывяду на Бабілон грамаду народаў вялікіх з зямлі паўночнай; і яны
пашыхтуюцца супраць яго і адтуль здабудуць яго. Стрэлы іхнія — як у спраўнага волата, не
вяртаюцца дарэмна.
10 І станецца Халдэя здабычаю, і насыцяцца ўсе, хто пустошыць яе, кажа ГОСПАД.
11 Радуйцеся і цешцеся, рабаўнікі спадчыны Маёй! Бо вы скачаце, як цяляты па траве, і іржыцё,
як жарэбчыкі.
12 Зьбянтэжылася маці вашая, асаромленая тая, якая вас нарадзіла. Вось, яна будзе апошняй
з народаў, пустыняй, сухою [зямлёй] і стэпам.
13 Дзеля гневу ГОСПАДА ня будзе ніхто жыць на ёй, але ўся яна станецца пусткаю. Кожны, хто
будзе праходзіць праз Бабілон, аслупянее і засьвішча дзеля ўсіх ранаў ягоных.
14 Пашыхтуйцеся супраць Бабілону навокал усе, якія нацягваеце лукі! Страляйце ў яго, не
шкадуйце стрэлаў, бо ён саграшыў супраць ГОСПАДА.
15 Гаманіце супраць яго вакол яго, бо ён падняў руку сваю. Упалі слупы ягоныя, разбураны
муры ягоныя, бо гэта помста ГОСПАДА. Адпомсьціце яму. Як ён рабіў, так зрабіце яму.
16 Зьнішчыце ў Бабілоне таго, хто сее, і таго, хто трымае серп у час жніва. Перад абліччам мяча
забойчага кожны вернецца да народу свайго і кожны ўцячэ ў зямлю сваю.
17 Ізраіль — заблукалая авечка, ільвы пагналі яго. Першы еў яго валадар Асірыйскі, а апошні,
Навухаданосар, валадар Бабілонскі, паламаў яму косткі.
18 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Вось, Я наведаю валадара
Бабілонскага і зямлю ягоную, як наведаў валадара Асірыйскага.
19 І Я прывяду Ізраіль на пашы ягоныя, і ён будзе пасьвіцца на Кармэлю і ў Башане, і на гары
Эфраіма, і ў Гілеадзе, і насыціцца душа ягоная”.
20 У тыя дні і ў той час, кажа ГОСПАД, будуць шукаць беззаконьне ў Ізраіля, і ня будзе яго, і
[шукаць] грахі ў Юды, і ня знойдуць іх, бо Я прабачу тых, якіх пакіну.
21 Выруш супраць зямлі Мэратаім і супраць жыхароў Пэкоду! Руйнуй і зьнішчы з закляцьцем,
кажа ГОСПАД, і зрабі ўсё, што Я табе загадаў!
22 Гармідар ваенны ў зямлі і зьнішчэньне вялікае.
23 Як пабіты і зламаны молат усёй зямлі! Як стаўся пустэчаю Бабілон сярод народаў!
24 Я паставіў на цябе сіло, і ты схоплены, Бабілон, а ты ня ведаў. Ты знойдзены і схоплены, бо
ты паўстаў супраць ГОСПАДА.
25 Адкрыў ГОСПАД скарбніцу Сваю і дастаў начыньні гневу Свайго, бо справу мае Госпад,
ГОСПАД Магуцьцяў, у зямлі Халдэйскай.
26 Прыходзьце да яе з канцоў [зямлі], адкрыйце ўсе клуні ейныя, і раскідайце яе як снапы, і
зрабіце яе закляцьцем, няхай ніхто не застанецца ў ёй.
27 Пазабівайце ўсіх валоў ейных, няхай ідуць яны на зарэз. Гора ім, бо надыйшоў дзень іхні,
час наведваньня іхняга.
28 Голас тых, якія ўцякаюць, і тых, якія выйшлі з зямлі Бабілонскай, каб абвясьціць на Сыёне
пра помсту ГОСПАДА, Бога нашага, пра помсту за сьвятыню Ягоную.
29 Склічце лучнікаў супраць Бабілону. Вы ўсе, якія нацягваеце лукі, станьце табарам вакол
яго, няхай ніхто не ўцячэ. Аднагарадзіце яму паводле справаў ягоных і тое, што ён вам рабіў,
зрабіце яму, бо ён выхваляўся супраць ГОСПАДА, супраць Сьвятога Ізраіля!

30 Дзеля гэтага пападаюць юнакі ягоныя на плошчах ягоных; і ўсе ваяры ягоныя змоўкнуць у
той дзень, кажа ГОСПАД.
31 Вось, Я супраць цябе, пыхлівец, кажа Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, бо прыйшоў дзень твой,
час наведваньня твайго.
32 І спатыкнецца пыхлівец, і ўпадзе, і ня будзе каму яго падняць, і Я запалю агонь у-ва ўсіх
гарадах ягоных, і ён спаліць усё навокал.
33 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: "Уцісканыя сыны Ізраіля і сыны Юды разам з імі, і ўсе, якія
зьняволілі іх, трымаюць іх і ня хочуць адпусьціць іх.
34 Адкупіцель іхні магутны. ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае. Баронячы, Ён будзе бараніць
справу іхнюю, каб даць супакой зямлі і ўстрывожыць жыхароў Бабілону".
35 Меч на Халдэйцаў, кажа ГОСПАД, і на жыхароў Бабілону, і на князёў ягоных, і на мудрацоў
ягоных!
36 Меч на варажбітоў, і яны стануцца дурнямі; меч на волатаў ягоных, і яны напужаюцца!
37 Меч на коней ягоных і на калясьніцы ягоныя, і на ўсю мешаніну [людзей], якая пасярод яго,
і будуць яны, як жанчыны; меч на скарбы ягоныя, і будуць яны разрабаваныя.
38 Меч на воды ягоныя, і яны высахнуць, бо гэта зямля ідалаў, яны хваляцца балванамі сваімі.
39 Дзеля гэтага будуць жыць у ім зьвяры пустыні, і шакалы, і страусы, і ня будзе больш ніколі
ён абжыты, і ніхто там не паселіцца з пакаленьня ў пакаленьне.
40 Як збурыў Бог Садом і Гамору і суседнія гарады, кажа ГОСПАД, ня будзе жыць там чалавек і
не паселіцца там сын чалавечы.
41 Вось, прыходзіць народ з поўначы, народ вялікі, і шматлікія валадары паўстаюць з канцоў
зямлі.
42 Яны трымаюць лук і дзіду, яны жорсткія і бязьлітасныя. Голас іхні — нібыта шуміць мора, і
яны едуць на конях, яны пашыхтаваныя як адзін чалавек да бою супраць цябе, дачка Бабілону!
43 Пачуў валадар Бабілону вестку пра іх, і аслабелі рукі ягоныя, жах ахапіў яго і боль як тую,
якая нараджае.
44 Вось, ён выходзіць як леў з гушчару над Ярданам на паплавы зялёныя. Я ў момант змушу яго
ўцякаць ад іх, а выбранага юнака пастаўлю над імі. Бо хто [падобны] да Мяне? І хто пакліча
Мяне [на суд]? І які пастыр устаіць перад абліччам Маім?
45 Дзеля гэтага паслухайце пра намер ГОСПАДА, які Ён мае супраць Бабілону, і думкі Ягоныя,
якія Ён мае адносна зямлі Халдэйскай. Выцягнуць нават найменшых авечак, і будуць
спустошаны пашы іхнія.
46 На вестку, што здабыты Бабілон, задрыжыць зямля, і крык будзе чутны сярод народаў.

Яр 51

1 Гэта кажа ГОСПАД: "Вось, Я збуджу супраць Бабілону і супраць жыхароў Лэб-Камай вецер
марскі.
2 І Я пашлю ў Бабілон тых, якія веюць, і яны разьвеюць яго і спустошаць зямлю ягоную, бо
адусюль зьвернуцца супраць яго ў дзень ліхі [для яго].
3 Няхай ніякі лучнік не нацягне лук свой, і няхай не апране панцыр свой! Не шкадуйце юнакоў
ягоных, зьнішчыце ўсё войска ягонае!"
4 І пападаюць забітыя ў зямлі Халдэйскай, і параненыя — на вуліцах ейных.
5 Бо не аўдавеў Ізраіль і Юда ў Бога свайго, у ГОСПАДА Магуцьцяў, бо зямля іхняя перапоўненая
злачынствамі супраць Сьвятога Ізраіля.
6 Уцякайце з сярэдзіны Бабілону! Няхай кожны ратуе душу сваю. Ня гіньце ў беззаконьнях
ягоных! Бо гэта час помсты ГОСПАДА. Ён аддасьць яму належную плату.
7 Бабілон у руцэ ГОСПАДА быў келіхам залатым, які напаіў усю зямлю. Віно ягонае пілі народы,
і дзеля таго шалелі народы.
8 Раптоўна ўпаў Бабілон, і зруйнавалі яго. Галасіце дзеля яго, вазьміце бальзам на боль ягоны,
можа, будзе аздароўлены.
9 "Лекавалі мы, лекавалі Бабілон, але ён не паздаравеў. Пакіньце яго, і хадзем кожны ў зямлю
сваю! Бо аж да неба дайшоў прысуд над ім і ўзьняўся аж да хмараў.

10 Зьявіў ГОСПАД праведнасьць нашую. Хадземце і распавядзем на Сыёне пра справы
ГОСПАДА, Бога нашага!”
11 Вастрыце стрэлы, вазьміце шчыты! Узбудзіў ГОСПАД дух валадара Мадаю, бо супраць
Бабілону намер Ягоны, каб зьнішчыць яго, бо гэта помста ГОСПАДА, помста за сьвятыню
Ягоную.
12 Супраць муроў Бабілону ўзьніміце сьцяг! Умацуйце варту, растаўце вартаўнікоў,
падрыхтуйце засады! Бо так вырашыў ГОСПАД, і ўчыніў тое, што прамовіў супраць жыхароў
Бабілону.
13 Ты, які жывеш над водамі вялікімі, са шматлікімі скарбамі, прыйшоў канец твой,
[напоўнілася] мера хцівасьці тваёй.
14 ГОСПАД Магуцьцяў прысягнуў на душу Сваю, што напоўніць цябе людзьмі як саранчою, і
яны ўзьнімуць над табою гармідар [ваенны].
15 Ён учыніў зямлю сілаю Сваёй, угрунтаваў сусьвет мудрасьцю Сваёй і розумам Сваім
расьцягнуў неба.
16 Калі гучыць голас Ягоны, шумяць воды ў небе, Ён прыносіць хмары з канца зямлі, маланкамі
суправаджае дождж і выклікае вецер са сховішчаў Сваіх.
17 Бязглузды кожны чалавек, які ня ведае [гэтага], асаромлены кожны залатар з прычыны
ідала [свайго], бо хлусьня — тое, што ён зрабіў, няма ў ім духа.
18 Марнота яны, праца, сьмеху вартая. У час наведваньня іхняга яны загінуць.
19 Не такая частка [спадчыны] Якуба, бо Ён укшталтаваў усё, і [Ізраіль —] племя спадчыны
Ягонай. ГОСПАД Магуцьцяў — імя Ягонае.
20 Ты — молат Мой, прылада вайны. Табою Я паб’ю народы і зьнішчу табою валадарствы.
21 Табою Я паб’ю каня і вершніка ягонага, табою паб’ю калясьніцу і возьніка ейнага.
22 Табою Я паб’ю мужчыну і жанчыну, табою паб’ю старога і маладога, табою паб’ю юнака і
дзяўчыну.
23 Табою Я паб’ю пастыра і чараду ягоную, табою паб’ю земляроба і воз ягоны, табою паб’ю
ваяводаў і ўрадоўцаў.
24 І Я аднагароджу Бабілону і ўсім жыхарам Халдэі за ўсю ліхоту іхнюю, якую яны зрабілі
супраць Сыёну на вачах вашых, кажа ГОСПАД.
25 Вось, Я на цябе, гара зьнішчэньня, кажа ГОСПАД, якая зьнішчыла ўсю зямлю, і Я выцягну
руку Маю да цябе, і сапхну цябе са скалы, зраблю цябе гарой, што палае.
26 І ня возьмуць з цябе ані камяня кутняга, ані камяня на падмурак, але будзеш спустошаная
на вякі, кажа ГОСПАД.
27 Узьніміце сьцяг на зямлі! Трубіце ў рог сярод народаў! Пасьвяціце супраць яго народы,
склічце супраць яго валадарствы Арарат, Міньні і Ашкеназ! Пастаўце супраць яго гетмана,
прывядзіце коней як саранчу калючую!
28 Пасьвяціце супраць яго народы, валадароў Мадаю, князёў ягоных, усіх ваяводаў ягоных і
ўсю зямлю панаваньня ягонага.
29 Дрыжыць зямля і трасецца, бо зьдзяйсьняецца намер ГОСПАДА супраць Бабілону, каб
зрабіць зямлю Бабілонскую пусткай бязьлюднай.
30 Волаты Бабілонскія кінулі ваяваць, сядзяць у крэпасьцях, зьнікла сіла іхняя, і сталіся яны
як жанчыны. Сядзібы іхнія спалены, і засаўкі іхнія паламаныя.
31 Пасланец за пасланцом бяжыць, і вестка за весткаю, каб паведаміць валадару Бабілонскаму,
што здабыты горад ягоны ад канца [да канца],
32 што броды захопленыя, умацаваньні спаленыя агнём, а ваяры ў трымценьні.
33 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля: “Дачка Бабілону [сталася] як ток у час малацьбы.
Яшчэ крыху, і прыйдзе для яе час жніва”.
34 “Зьядаючы, зьеў мяне і, трушчачы, струшчыў мяне Навухаданосар, валадар Бабілонскі, і,
кідаючы, кінуў мяне як пустую пасудзіну, як цмок праглынуў мяне, і напоўніў жывот свой
асалодамі маімі, і выпіхваючы, выпхнуў мяне [з сябе].

35 Пакуты мае і цела маё — на Бабілоне”, — кажа жыхарка Сыёну. “І кроў мая — на жыхарах
Халдэі”, — кажа Ерусалім.
36 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: “Вось, Я абараню справу тваю, адпомшчу помсту тваю, і
высушу мора ягонае, і высушу крыніцу ягоную.
37 І станецца Бабілон руінаю, прыстанішчам цмокаў, страхоцьцем і пасьмешышчам, і
бязьлюдзьдзем.
38 Заравуць яны разам быццам ільвы, замуркочуць як малыя львяняты.
39 Калі яны будуць разагрэтыя, Я падрыхтую для іх гасьціну, і напаю іх, каб усьцешыліся і
заснулі сном вечным, і не прачнуліся, кажа ГОСПАД.
40 І Я павяду іх на зарэз як ягнятаў, як бараноў з казламі”.
41 Як здабыты Шэшах, як узята хвала ўсёй зямлі! Як стаўся Бабілон пусткаю паміж народаў!
42 Нахлынула мора на Бабілон, і закрыла яго безьліч хваляў ягоных.
43 Гарады ягоныя сталіся пустэчаю, зямлёю сухою і стэпам, зямлёю, дзе ніводзін чалавек не
жыве і ня ходзіць па ёй сын чалавечы.
44 І Я наведаю Бэля ў Бабілоне, і вырву з вуснаў ягоных тое, што ён праглынуў, і ня будуць
больш да яго плысьці народы, і мур Бабілону ўпадзе!
45 Выйдзі з яго, народзе Мой, і няхай кожны ратуе душу сваю ад лютасьці гневу ГОСПАДА.
46 Няхай ня млее сэрца вашае, і ня бойцеся весткі, якую чуеце на зямлі, бо ў [адзін] год прыйдзе
вестка, а пасьля яе [другая] вестка ў год [гэты], і на зямлі [будзе] гвалт, і валадар [паўстане]
на валадара.
47 Дзеля гэтага вось, надыходзяць дні, і Я наведаю Бабілон, і ўся зямля ягоная будзе
асаромленая, і ўсе забітыя будуць ляжаць пасярод яго.
48 І засьпяваюць над Бабілонам неба і зямля, і ўсё, што ў іх, бо з поўначы прыходзіць на яго
спусташальнік, кажа ГОСПАД.
49 Бабілон упадзе за забітых Ізраіля, як упалі за Бабілон забітыя ўсёй зямлі.
50 Хто ўратаваўся ад мяча, уцякайце, ня стойце! [Хоць вы] далёка, памятайце пра ГОСПАДА, і
Ерусалім няхай узыйдзе ў сэрцы вашым.
51 “Мы асаромленыя, бо чулі зьнявагу, і ганьба пакрыла абліччы нашыя, бо ўвайшлі чужынцы
ў сьвятыню Дому ГОСПАДА”.
52 Дзеля гэтага вось, надыходзяць дні, кажа ГОСПАД, і Я наведаю ідалаў ягоных, і на ўсёй зямлі
ягонай будуць стагнаць параненыя.
53 Калі нават да неба падымецца Бабілон, і на вышынях умацуе сілу сваю, ад Мяне прыйдуць
да яго нішчыцелі, кажа ГОСПАД.
54 Голас крыку чуцён з Бабілону, і зьнішчэньне вялікае на зямлі Халдэйскай,
55 бо ГОСПАД нішчыць Бабілон і сьцішае ў ім голас вялікі. І шумяць хвалі іхнія як воды вялікія,
і ўздымаецца плёскат голасу іхняга.
56 Бо ідзе на яго, на Бабілон, нішчыцель, і будуць схоплены волаты ягоныя, і будуць зломленыя
лукі ягоныя, бо Бог помсты, ГОСПАД, адплачваючы, адплаціць [яму].
57 І Я напаю князёў ягоных, і мудрацоў ягоных, і ваяводаў ягоных, і ўрадоўцаў ягоных, і волатаў
ягоных, і яны заснуць сном вечным, і не прачнуцца, кажа Валадар. ГОСПАД Магуцьцяў — імя
Ягонае.
58 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Шырокі мур Бабілону разбурэньнем будзе разбураны,
і брамы ягоныя высокія будуць спаленыя агнём, і надарма мучаліся народы, і для агню
марнавалі [сілы] плямёны”».
59 Слова, якое загадаў Ярэмія прарок Сэраі, сыну Нэрыі, сына Махсэі, калі той пайшоў з
Сэдэкіем, валадаром Юды, у Бабілон у чацьвёртым годзе валадараньня ягонага, а Сэрая [быў]
падкаморым.
60 І напісаў Ярэмія ў адной кнізе ўсё ліха, якое мела прыйсьці на Бабілон, усе словы гэтыя,
напісаныя супраць Бабілону.
61 І сказаў Ярэмія Сэраі: «Калі ты прыйдзеш у Бабілон, тады ўбачыш і прачытаеш усе словы
гэтыя,

62 і скажаш: “ГОСПАДЗЕ, Ты прамовіў пра месца гэтае, што зьнішчыш яго так, што ня будзе ў
ім жыхароў, ані людзей, ані быдла, бо будзе яно пустэчаю вечнай”.
63 І станецца, калі скончыш чытаць кнігу гэтую, прывяжы да яе камень і ўкінь яе ў сярэдзіну
Эўфрату,
64 і скажы: “Так патоне Бабілон і не падымецца дзеля ліха гэтага, якое Я прывяду на яго, і
будуць яны зьнішчаныя”». Дасюль словы Ярэміі.

Яр 52

1 Сэдэкія меў дваццаць адзін год, калі заваладарыў, і адзінаццаць гадоў валадарыў у Ерусаліме.
Імя маці ягонай — Хамуталь, дачка Ярэміі з Лібны.
2 І рабіў ён ліхое ў вачах ГОСПАДА, усё так, як рабіў Егаякім.
3 Бо сталася гэта з прычыны гневу ГОСПАДА на Ерусалім і Юду, бо Ён адкінуў іх ад аблічча
Свайго. І збунтаваўся Сэдэкія супраць валадара Бабілонскага.
4 І сталася ў дзявятым годзе валадараньня ягонага, у дзясятым месяцы, у дзясяты [дзень]
месяца прыйшоў Навухаданосар, валадар Бабілонскі, ён і ўсё войска ягонае, да Ерусаліму і
аблажыў яго, і пабудаваў кругом яго валы.
5 І горад быў у аблозе аж да адзінаццатага году валадара Сэдэкіі.
6 У чацьвёртым месяцы, у дзявяты [дзень] месяца запанаваў голад у горадзе, і не было хлеба
для народу зямлі.
7 І быў зроблены вылом у муры гораду, і ўсе ваяры ўцяклі і выйшлі з гораду ўначы праз браму
між падвойным мурам, які каля саду валадара, а Халдэйцы былі вакол гораду. І выйшлі яны
дарогай у бок Арабы.
8 І войска Халдэйскае гналася за валадаром, і дагналі Сэдэкію ў стэпе каля Ерыхону, і ўсё
войска ягонае рассыпалася ад яго.
9 І схапілі валадара, і завялі яго ў Рыўлю ў зямлі Хамат да валадара Бабілонскага, і ён выдаў на
яго прысуд.
10 І забіў валадар Бабілонскі сыноў Сэдэкіі на вачах ягоных, а таксама ўсіх князёў Юды
пазабівалі ў Рыўлі.
11 І [Навухаданосар] вырваў вочы Сэдэкіі і закаваў яго ў кайданы, і завёў яго валадар Бабілонскі
ў Бабілон, і ўкінуў у вастрог аж да дня сьмерці ягонай.
12 А ў пятым месяцы, у дзясяты [дзень] месяца, а [быў] гэта дзевятнаццаты год
Навухаданосара, валадара Бабілонскага, увайшоў у Ерусалім Нэвузарадан, начальнік
целаахоўнікаў, які стаяў перад абліччам валадара Бабілонскага.
13 І спаліў ён Дом ГОСПАДА, і дом валадара, і ўсе дамы ў Ерусаліме, і кожны вялікі дом спаліў
агнём.
14 І зруйнавала ўвесь мур вакол Ерусаліму войска Халдэйскае, якое [было] з начальнікам
целаахоўнікаў.
15 А галоту народу і рэшту народу, якая засталася ў горадзе, і ўцекачоў, якія перайшлі да
валадара Бабілонскага, і рэшту людзей простых выгнаў [у няволю] Нэвузарадан, начальнік
целаахоўнікаў.
16 А [некаторых] з галоты народу зямлі пакінуў Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, як
вінаградараў і земляробаў.
17 І паламалі Халдэйцы слупы мядзяныя, якія [былі] ў Доме ГОСПАДА, і падставы, і мора
мядзянае, якое [было] ў Доме ГОСПАДА, і ўсю медзь вывезьлі ў Бабілон.
18 І ўзялі яны катлы, лапаткі, нажніцы, крапільніцы, лыжкі і ўвесь посуд мядзяны, якім
[карысталіся] пры служэньні.
19 І місы, папяльніцы, крапільніцы, збаны, сьвечнікі, келіхі і лыжкі, і што было з золата, [усё]
золата, і што было са срэбра, [усё] срэбра забраў начальнік целаахоўнікаў.
20 І два слупы, адно мора, дванаццаць валоў мядзяных, [медзь] ад падставаў, якія зрабіў для
Дому ГОСПАДА валадар Салямон, і нельга было зважыць медзі з усіх тых рэчаў.

21 Слупы [былі такія:] васямнаццаць локцяў вышыні адзін слуп, і шнур у дванаццаць локцяў
апаясваў яго, таўшчыня ягоная — чатыры пальцы, а ў сярэдзіне — пусты.
22 На ім [была] галавіца з медзі, а вышыня адной галавіцы — пяць локцяў, і сеціва, і яблыкі
гранатовыя кругом галавіцы, усё з медзі. І другі слуп быў такі самы, і яблыкі гранатовыя.
23 І было дзевяноста шэсьць яблыкаў гранатовых уздоўж, а ўсяго было вакол на сеціве сто
яблыкаў гранатовых.
24 І схапіў начальнік целаахоўнікаў Сэраю, галоўнага сьвятара, і сьвятара-намесьніка Цэфанію,
і трох прыдзьвернікаў.
25 А ў горадзе схапіў ён аднаго эўнуха, які быў начальнікам войска, і сем чалавек, якія бачаць
аблічча валадара, якіх знайшлі ў горадзе, і пісара начальніка войска, які рабіў попіс народу
зямлі, і шэсьцьдзясят людзей простых, якіх знайшлі ў горадзе.
26 І ўзяў іх Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, і завёў іх да валадара Бабілонскага ў Рыўлю.
27 І забіў іх валадар Бабілонскі, і замардаваў іх у Рыўлі ў зямлі Хамат. І быў выгнаны Юда з
зямлі сваёй.
28 Вось народ, які выгнаў [у няволю] Навухаданосар: у сёмым годзе — тры тысячы дваццаць
тры Юдэі;
29 у васямнаццатым годзе Навухаданосара — васемсот трыццаць дзьве душы з Ерусаліму;
30 у дваццаць трэцім годзе Навухаданосара Нэвузарадан, начальнік целаахоўнікаў, выгнаў [у
няволю] семсот сорак пяць душаў Юдэяў. Усіх [разам] — чатыры тысячы шэсьцьсот душаў.
31 І сталася ў трыццаць сёмым годзе выгнаньня Егаяхіна, валадара Юды, у дванаццатым
месяцы, у дваццаць пяты [дзень] месяца, Эвіль-Мэрадах, валадар Бабілонскі, у год, калі
заваладарыў, падняў галаву Егаяхіну, валадару Юды, і вывеў яго з вязьніцы.
32 І ён прамаўляў да яго добра, і ўзьняў пасад ягоны па-над пасады валадароў, якія [былі] з ім
у Бабілоне.
33 І зьняў Егаяхін шаты свае вязьнічныя, і еў хлеб заўсёды перад абліччам ягоным у-ва ўсе дні
жыцьця свайго.
34 І [адносна] ежы ягонай, ежа заўсёды давалася яму ад валадара Бабілонскага дзень у дзень
аж да сьмерці ягонай у-ва ўсе дні жыцьця ягонага.

ПЛАЧ ЯРЭМІІ

1 Як сядзіць самотна сталіца, [некалі] шматлюдная! Сталася як удава тая, якая [была] вялікай
сярод народаў. Княгіня сярод краінаў сталася нявольніцай!
2 Яна плачма плача ўначы, і сьлёзы ейныя на шчоках у яе. Няма для яе пацяшальніка з усіх,
што любілі яе; усе сябры ейныя здрадзілі ёй, сталі ворагамі для яе.
3 Юдэя ўзята ў палон, [яна] ў горы і няволі вялікай, яна жыве паміж паганамі, не знаходзіць
супачынку; усе перасьледвальнікі ейныя дагналі яе ў [месцах] цесных.
4 Смутныя шляхі [дачкі] Сыёну, ніхто ня прыйдзе на сьвяты; усе брамы яе спустошаныя;
сьвятары яе енчаць; дзяўчаты яе пакутуюць, і горка ёй.
5 Прыгнятальнікі яе сталіся галавою, ворагі яе маюць посьпех, бо ГОСПАД даў ёй пакуты за
мноства правінаў яе; дзеці яе пайшлі ў палон перад абліччам прыгнятальніка.
6 І адыйшла ад дачкі Сыёну ўся велічнасьць яе; князі яе сталіся як алені, якія не знаходзяць
пашы, і ідуць яны бяз сілы перад перасьледвальнікам.
7 Узгадвае Ерусалім у дні нядолі сваёй і гаротнасьці сваёй усе каштоўнасьці свае, якія былі ў
дні даўнейшыя, [перад тым,] як патрапіў народ ягоны ў руку прыгнятальніка, і няма нікога,
хто дапаможа яму, і бачаць гэта прыгнятальнікі, і сьмяюцца з руінаў ягоных.
8 Грэхам зграшыла [дачка] Ерусаліму, дзеля гэтага сталася нячыстаю; усе, хто шанавалі яе,
пагарджаюць ёю, бо бачылі голасьць ейную; яна таксама енчыць і адварочваецца [ад усіх].
9 Нячыстасьць ейная — на прыполах ейных, яна ня ўзгадвала пра канец свой; і яна ўпала
незвычайна, не было пацяшальніка ў яе. «Глянь, ГОСПАДЗЕ, на нядолю маю, бо ўзьвялічыўся
вораг».
10 Прыгнятальнік выцягнуў руку сваю на ўсе каштоўныя рэчы ейныя, яна бачыла, што ўвайшлі
ў сьвятыню ейную пагане, пра якіх Ты загадаў, што яны ня ўвойдуць у царкву Тваю.
11 Увесь народ ейны енчыць, шукаючы хлеба, яны аддалі каштоўныя рэчы свае за ежу, каб
ажывіць душу сваю. «Глянь, ГОСПАДЗЕ, і прыгледзься, бо я сталася нікчэмнаю».
12 «Гэта нішто для вас! Усе вы, што ідзеце па дарозе, прыгледзьцеся і пабачце, ці ёсьць такі
боль, як мой боль, які зроблены мне, якім ГОСПАД даў пакуты [мне] ў дзень палючага гневу
Свайго.
13 З вышыні Ён паслаў агонь у косткі мае і запанаваў над імі; расьцягнуў сетку на ногі мае,
павярнуў мяне назад, зрабіў мяне спустошанаю і мляваю ўвесь дзень.
14 Ярмо правінаў маіх зьвязана рукою Ягонай; яны сплеценыя, узыйшлі на шыю маю; Ён
паваліў сілу маю; Госпад аддаў мяне ў рукі, з якіх я не магу вырвацца.
15 Госпад сапхнуў усіх дужых сярод мяне, склікаў грамаду супраць мяне, каб струшчыць
юнакоў маіх; як у тоўчні, стаптаў Госпад дзяўчыну, дачку Юды.
16 З гэтае прычыны я плачу; вока маё, вока маё выцякае вадою, бо далёка ад мяне пацяшальнік,
які ажывіў бы душу маю; сыны мае зьнішчаныя, бо ўзьвялічыўся вораг».
17 Выцягвае рукі свае [дачка] Сыёну, няма каму пацешыць яе. ГОСПАД загадаў пра Якуба, вакол
яго прыгнятальнікі ягоныя; [дачка] Ерусаліму сталася нячыстаю сярод іх.
18 «Праведны ГОСПАД, бо я бунтавалася супраць [слова] вуснаў Ягоных. Слухайце, прашу, усе
народы, і пабачце боль мой: дзяўчаты мае і юнакі мае пайшлі ў палон.
19 Я клікала каханкаў маіх, але яны падманулі мяне; сьвятары мае і старшыні мае гінуць у
горадзе, шукаючы ежы сабе, каб ажывіць душы свае.
20 Глянь, ГОСПАДЗЕ, бо цесна мне, унутранасьць мая скорчылася, сэрца маё пераварочваецца
ў-ва мне, бо бунтуючыся, я збунтавалася; звонку меч забірае дзяцей, а ў доме — сьмерць.
21 Яны пачулі, што я енчу, і няма каму пацешыць мяне; усе ворагі мае пачулі пра нядолю маю
і цешацца, што Ты ўчыніў [гэта]. Прывядзі [на іх] дзень, які Ты прадказаў, і няхай будзе з імі,
як са мною!
22 Няхай уся ліхота іхняя прыйдзе перад аблічча Тваё, і ўчыні ім так, як Ты ўчыніў мне за ўсе
правіны мае, бо вялікі енк мой, і сэрца маё млоснае».

Плач 2

1 Як закрыў Госпад хмарай гневу Свайго дачку Сыёну, скінуў з неба на зямлю славу Ізраіля і
не ўзгадаў у дзень гневу Свайго пра падножжа пад ногі Свае.
2 Праглынуў Госпад, не пашкадаваў усе пашы Якуба; зруйнаваў у абурэньні Сваім гарады
ўмацаваныя дачкі Юды, кінуў на зямлю, апаганіў валадарства і князёў ягоных.
3 Адсек у полымі гневу ўвесь рог Ізраіля, прыбраў правіцу Сваю ад аблічча ворага і ўзгарэўся
супраць Якуба, як полымя агню, якое жарэ [ўсё] навокал.
4 Нацягнуў лук Свой, як вораг, выставіў правіцу Сваю, як прыгнятальнік, і забіў усё што было
каштоўнае для вока; у намёце дачкі Сыёну выліў гнеў Свой, як агонь.
5 Госпад стаў як вораг, праглынуў Ізраіля, праглынуў усе палацы ягоныя, зруйнаваў гарады
ўмацаваныя ягоныя і памножыў у дачкі Юды стогн і смутак.
6 Разваліў агароджу Сваю [вакол] саду, зьнішчыў [месцы] спатканьняў Сваіх; ГОСПАД зрабіў,
што забыліся на Сыёне пра сьвяты і суботы, і пагрэбаваў у абурэньні гневу Свайго валадаром
і сьвятаром.
7 Адкінуў Госпад ахвярнік Свой, пагрэбаваў сьвятыняй Сваёй, аддаў у руку ворага муры
палацаў ейных; яны ўзьнялі голас у Доме ГОСПАДА, як у дзень сьвяточны.
8 Пастанавіў ГОСПАД зруйнаваць муры дачкі Сыёну, працягнуў шнур, не ўхіліў рукі Сваёй ад
нішчэньня, і апрануў у жалобу вежы і муры, яны разам змарнелі.
9 Абрынуліся на зямлю брамы яе; Ён зьнішчыў і паламіў завалы іхнія; валадар яе і князі яе між
паганамі; няма Закону, і прарокі ейныя не знаходзяць відзежу ад ГОСПАДА.
10 Сядзяць на зямлі, маўчаць старшыні дачкі Сыёну, пасыпалі попелам галовы свае,
падперазаліся зрэбніцаю; схілілі да зямлі галовы свае дзяўчыны Ерусалімскія.
11 Выцяклі сьлязьмі вочы мае, унутранасьці мае скорчыліся, вантробы мае вываліліся на
зямлю з прычыны загубы дачкі народу майго, калі дзеці і немаўляты зьнемагаюць на вуліцах
гораду.
12 Яны кажуць да маці сваіх: «Дзе збожжа і віно?», калі яны зьнемагаюць, як параненыя, на
вуліцах гораду, калі душа іхняя выліваецца на ўлоньнях маці іхніх.
13 Што я засьведчу табе? З кім параўнаю цябе, дачка Ерусаліму? Каго параўнаю з табою, каб
пацешыць цябе, дзяўчына, дачка Сыёну? Бо вялікая, як мора, загуба твая. Хто можа вылечыць
цябе?
14 Прарокі твае мелі для цябе відзежы марныя і фальшывыя, не адкрывалі беззаконьня твайго,
каб адвярнуць [ад цябе] палон твой, але мелі відзежы для цябе, цяжары марныя і падманлівыя.
15 Пляскаюць у далоні свае над табою ўсе, якія праходзяць дарогаю, сьвішчуць і ківаюць
галовамі сваімі над дачкою Ерусаліму: «Хіба гэта той горад, пра які казалі: “Дасканаласьць
прыгажосьці, радасьць для ўсёй зямлі”?».
16 Разявілі пашчы свае на цябе ўсе ворагі твае, сьвішчуць і скрыгочуць зубамі, кажуць: «Мы
праглынулі [яе]! Гэта сапраўды той дзень, якога мы чакалі, мы знайшлі яго, мы бачылі».
17 Учыніў ГОСПАД тое, што задумаў; Ён споўніў слова Сваё, якое загадаў ад дзён старадаўніх,
зруйнаваў і не пашкадаваў, і ўзрадаваў над табою ворага твайго, узьняў рог прыгнятальнікаў
тваіх.
18 Крычала сэрца іхняе да Госпада. О, мур дачкі Сыёну! Няхай выліваюцца, як ручай, сьлёзы
ўдзень і ўначы, не давай сабе адпачынку, няхай не супакойваецца зрэнка вока твайго.
19 Уставай, галасі сярод ночы, на пачатку варты [начной] вылівай, як ваду, сэрца сваё перад
абліччам Госпада; узьнімі рукі свае да Яго за душу немаўлятаў тваіх, якія зьнемагаюць з голаду
на ростанях усіх вуліцаў.
20 Глянь, ГОСПАДЗЕ, і прыгледзься, каму Ты ўчыніў гэта. Ці маюць жанчыны есьці плод свой,
немаўлятаў, якіх выкармілі? Ці маюць быць забіваныя ў сьвятыні Госпада сьвятар і прарок?
21 Ляжаць на зямлі на вуліцах маладыя і старыя; дзяўчыны мае і юнакі мае пападалі ад мяча;
Ты забіў [іх] у дзень гневу Твайго, пусьціў на зарэз, не пашкадаваў.
22 Ты паклікаў, як на дзень сьвяточны, жахі мае адусюль. У дзень гневу ГОСПАДА ніхто ня ўцёк
і ніхто не застаўся; тых, што я выкарміў і выгадаваў, выгубілі ворагі мае.

Плач 3

1 Я — той муж, які бачыў гора ад кію гневу Ягонага.
2 Ён вёў мяне і прывёў у цемру, а не ў сьвятло.
3 Толькі супраць мяне Ён павярнуўся. Ён зьвярнуў руку Сваю на мяне ўвесь дзень.
4 Ён зьнішчыў цела маё і скуру маю, патрушчыў косткі мае.
5 Ён забудаваў [агароджай] мяне і атачыў жоўцю і гаротаю,
6 пасадзіў мяне ў месца цёмнае, як памерлых даўно.
7 Ён абгарадзіў мяне, і я ня выйду; Ён зрабіў цяжкімі кайданы мае.
8 Нават калі я крычу і малю, Ён спыняе малітву маю.
9 Ён абгарадзіў шляхі мае часанымі камянямі, скрывіў сьцежкі мае.
10 Ён для мяне — як мядзьведзь, што цікуе, як леў у засадзе.
11 Ён забраў шляхі мае і разьдзёр мяне, пакінуў мяне спустошаным.
12 Ён нацягнуў лук свой і паставіў мяне як мэту для стралы,
13 пусьціў у ныркі мае стрэлы з сагайдаку Свайго.
14 Я стаў насьмешкай для ўсяго народу свайго, прыпеўкаю іхняй увесь дзень.
15 Ён насыціў мяне горкімі травамі, напаіў мяне палыном,
16 пакрышыў зубы мае жвірам, выкачаў мяне ў попеле.
17 Ён аддаліў душу маю ад супакою, я забыўся пра добрае.
18 І я сказаў: «Загінула сіла мая і спадзяваньне маё на ГОСПАДА».
19 Узгадай нядолю маю і гаротнасьць маю, палын і жоўць.
20 Узгадваючы, узгадвае [пра Цябе] і гнецца ў-ва мне душа мая.
21 Я вяртаю гэта да сэрца майго, і дзеля гэтага я спадзяюся.
22 Гэта міласэрнасьць ГОСПАДА, што мы не загінулі, бо не спынілася літасьць Ягоная.
23 Яна аднаўляецца кожную раніцу; вялікая вернасьць Твая.
24 «ГОСПАД — гэта частка мая, — казала душа мая, — дзеля гэтага я спадзяюся на Яго».
25 Добры ГОСПАД да тых, якія на Яго спадзяюцца, да душы, якая шукае Яго.
26 Добра мець надзею і маўкліва [чакаць] збаўленьня ад ГОСПАДА.
27 Добра для чалавека, які носіць ярмо ў маладосьці сваёй.
28 Няхай ён сядзіць самотна і маўчыць, бо Ён узлажыў на яго [ярмо].
29 Няхай закрые пылам вусны свае, можа, ёсьць [яшчэ] надзея.
30 Няхай падставіць шчаку таму, які б'е яго, няхай насыціцца ганьбаю,
31 бо не адкідае на вякі Госпад,
32 бо Ён дае пакуты, але літуецца паводле мноства міласэрнасьці Сваёй,
33 бо не з [жаданьня] сэрца Свайго Ён прыгнятае і дае пакуты сынам чалавечым.
34 Калі топчуць пад нагамі сваімі ўсіх вязьняў зямлі,
35 калі перакручваюць суд для чалавека перад абліччам Найвышэйшага,
36 калі блытаюць чалавека ў справе [судовай], хіба Госпад ня бачыць [гэта]?
37 Хто той, які скажа, і [так] станецца, а Госпад [пра гэта] не загадаў?
38 Ці ня з вуснаў Найвышэйшага выходзіць ліха і дабро?
39 Чаму наракае чалавек, які жыве? Няхай чалавек [наракае] на грахі свае.
40 Будзем шукаць і дасьледаваць шляхі свае, і вернемся да ГОСПАДА.
41 Узьнясем сэрцы нашыя і далоні да Бога ў небе.
42 Мы адступіліся і збунтаваліся, Ты не дараваў.
43 Ты закрыў Сябе гневам і перасьледаваў нас, забіваў і не шкадаваў.
44 Ты закрыў Сябе хмараю, каб не дайшла малітва [да Цябе].
45 Ты ўчыніў нас сьмецьцем і агідаю паміж народамі.
46 Разьзявілі на нас пашчы свае ўсе ворагі нашыя.
47 Страх і яма сталіся ў нас, спусташэньне і загуба.
48 Струмяні вады цякуць з вока майго з прычыны загубы дачкі народу майго.

49 Вока маё выліваецца безупынна, няма палёгкі,
50 аж пакуль ня ўзгляне і ня ўбачыць ГОСПАД з неба.
51 Вока маё засмучае душу маю дзеля ўсіх дочак гораду майго.
52 Палюючы, палююць на мяне, як на птушку, ворагі мае без прычыны.
53 Кінулі ў яму жыцьцё маё і кідалі ў мяне камяні.
54 Воды паліліся на галаву маю, я сказаў: “Я загінуў”.
55 Я клікаў імя Тваё, ГОСПАДЗЕ, з ямы найглыбейшай.
56 Ты чуў голас мой. Не закрывай вуха Тваё ад уздыханьня майго, ад ляманту майго.
57 Ты наблізіўся [да мяне] ў дзень, калі я клікаў Цябе. Ты сказаў: “Ня бойся”.
58 Ты бараніў мяне, Госпадзе, у справе душы маёй, Ты адкупіў жыцьцё маё.
59 Ты бачыў, ГОСПАДЗЕ, крыўду маю, судзі суд мой.
60 Ты бачыў усю помсту іхнюю, усе намеры іхнія супраць мяне.
61 Ты чуў ганьбаваньне іхняе, ГОСПАДЗЕ, усе намеры іхнія супраць мяне,
62 вусны тых, якія паўсталі на мяне, і разважаньні іхнія супраць мяне ўвесь дзень.
63 Паглядзі, як яны сядаюць і ўстаюць, а я — прыпеўка для іх.
64 Вярні ім аднагароду, ГОСПАДЗЕ, паводле справаў рук іхніх.
65 Дай ім смутак сэрца, праклён Твой [няхай будзе] на іх.
66 Перасьледуй [іх] у гневе і зьнішчы іх з-пад неба ГОСПАДАВАГА.

Плач 4

1 Як пацямнела золата, як зьмянілася шчырае золата добрае! Камяні сьвятыні параскіданыя на ростанях усіх вуліцаў.
2 Сыны Сыёну, каштоўныя, якія цэняцца як золата найчысьцейшае, [цяпер] лічацца за посуд гліняны, за працу рук ганчара!
3 Нават цмокі марскія даюць грудзі, кормяць дзіцянят сваіх; а дачка народу майго [сталася] бязьлітаснай, як страус у пустыні.
4 Язык немаўляці ліпне да паднябеньня ад смагі; дзеткі просяць хлеба, і няма нікога, хто адломіць ім [кавалак].
5 Тыя, што елі прысмакі, зьнемагаюць на вуліцах; тыя, што апраналіся ў пурпур, абдымаюць [купы] гною.
6 І павялічылася беззаконьне дачкі народу майго болей за грэх Садому, які быў перакулены ў адзін момант, і рукі не дакраналіся да яго.
7 Назіры ейныя былі чысьцейшыя за сьнег, бялейшыя за малако, целы іхнія былі чырванейшыя за каралі; яны выглядалі як шафір.
8 [А цяпер] выгляд іхні цямнейшы за сажу; не пазнаюць іх на вуліцах; скура іхняя прыліпла да костак іхніх, высахла, сталася як дрэва.
9 Лепш было забітым мячом, чым забітым голадам, бо тыя канаюць, прабітыя [мячом], а гэтыя — з нястачы пладоў палявых.
10 Рукі жанчынаў чульлівых варылі дзетак сваіх, якія сталіся ежаю для іх у [час] загубы дачкі народу майго.
11 ГОСПАД скончыў гнеў Свой, выліў палючы гнеў Свой і запаліў агонь на Сыёне, і ён зжэр падваліны ягоныя.
12 Ня верылі валадары зямныя і ўсе жыхары сусьвету, што прыгнятальнік і вораг увойдзе ў брамы Ерусаліму.
13 За грахі прарокаў ягоных, за беззаконьні сьвятароў ягоных, якія разьлівалі пасярод яго кроў праведных, [сталася гэта].
14 Яны бадзяліся па вуліцах як сьляпыя, яны заплямленыя крывёю; ніхто ня мог дакранацца да адзеньня іхняга.
15 «Адыйдзіцеся, нячыстыя!» — крычалі на іх. — «Адыйдзіцеся, адыйдзіцеся, не дакранайцеся!» І яны ўцяклі і бадзяліся; і казалі між народамі: «Яны больш ня будуць [тут] жыць».

16 Абліччa ГОСПАДА расьцярушыла іх, Ён больш ня будзе глядзець на іх, [бо] яны абліччы
сьвятароў не падымаюць і старым не спагадаюць.
17 Выцяклі вочы нашыя, марна чакаючы дапамогі; на варце [сваёй] выглядалі мы народ, які ня
можа збавіць.
18 Яны палююць на крокі нашыя, каб мы не маглі хадзіць па вуліцах нашых. Канец наш блізка;
споўніліся дні нашыя, бо прыйшоў канец наш.
19 Хутчэйшыя за арлоў паднебных былі перасьледвальнікі нашыя, па гарах гналіся за намі, у
пустыні рабілі засаду на нас.
20 Дух ноздраў нашых, памазанец ГОСПАДА злоўлены ў ямы іхнія, а мы казалі пра яго: «У ценю
ягоным будзем жыць між народамі».
21 Весяліся і радуйся, дачка Эдому, якая жывеш у зямлі Уц! Да цябе таксама дойдзе келіх,
нап'ешся і аголішся.
22 Скончылася беззаконьне тваё, дачка Сыёну! Ён ня будзе больш выганяць цябе ў палон. Ён
наведае беззаконьні твае, дачка Эдому, адкрые грахі твае.

Плач 5

1 Узгадай, ГОСПАДЗЕ, што сталася з намі; гледзячы, узглянь і пабач ганьбу нашую.
2 Спадчына нашая перададзеная чужым, дамы нашыя — чужынцам.
3 Мы сталіся сіротамі; няма бацькі, маці нашыя — як удовы.
4 Ваду сваю мы п'ем за срэбра, дровы нашыя прадаюць нам на грошы.
5 Перасьледвальнікі на шыі нашай, мы цяжка працуем, ня маем супачынку.
6 Мы выцягнулі руку сваю да Эгіпту і да Асірыі, каб насыціцца хлебам.
7 Бацькі нашыя грашылі; і іх няма, і беззаконьні іхнія мы носім.
8 Слугі пануюць над намі, і няма [нікога], хто вызваліць нас з рукі іхняй.
9 Прыносім хлеб свой, наражаючы душу сваю на меч у пустыні.
10 Скура нашая распаленая, як печ, ад палючага голаду.
11 Жанчын гвалцілі на Сыёне, дзяўчат — у гарадах Юды.
12 Князі павешаныя рукамі іхнімі, абліччы старых ня маюць пашаны.
13 Юнакі носяць камяні млыновыя, хлопцы спатыкаюцца, [носячы] дровы.
14 Старыя больш не сядзяць у брамах, юнакі не сьпяваюць.
15 Спынілася вясёласьць сэрца нашага, перамяніліся ў жалобу карагоды нашыя.
16 Звалілася карона з галавы нашай; гора нам, бо мы саграшылі.
17 Дзеля гэтага млявае сэрца нашае, дзеля гэтага зацемраныя вочы нашыя,
18 бо спустошаная гара Сыён, лісы ходзяць па ёй.
19 Ты, ГОСПАДЗЕ, трываеш на вякі, пасад Твой — з пакаленьня ў пакаленьне.
20 Чаму Ты забыўся на нас назаўсёды, пакінуў нас на доўгія дні?
21 Навярні нас да Сябе, ГОСПАДЗЕ, і мы навернемся; аднаві дні нашыя, як даўней [было].
22 Няўжо Ты, адкідаючы, адкінуў нас? Няўжо Ты загневаўся на нас аж так моцна?

КНІГА ПРАРОКА ЭЗЭКІЭЛЯ

1 І сталася ў трыццатым годзе, у чацьвёртым [месяцы], у пятым [дні] месяца, і я [стаяў] сярод
выгнанцаў над ракою Кевар. Адкрыліся нябёсы, і я бачыў відзеж Божы.
2 У пяты [дзень] месяца, а гэта быў пяты год палону валадара Егаякіма,
3 было слова ГОСПАДА да Эзэкіэля, сына Бузі, сьвятара, у зямлі Халдэйцаў над ракою Кевар. І
была там над ім рука ГОСПАДА.
4 І я ўбачыў, і вось, вецер гвалтоўны прыйшоў з поўначы, і хмара вялікая, і агонь палючы, і
зьзяньне кругом, а ў сярэдзіне ягонай — нібыта бурштын, [які зьзяе] ў сярэдзіне агню.
5 А ў сярэдзіне ягонай было падабенства чатырох [істотаў] жывых; і мелі яны выгляд чалавека.
6 І кожная мела чатыры абліччы, і кожная мела чатыры крылы.
7 Ногі іхнія — ногі простыя, а стопы ног іхніх — як стопы ног цяляці; і блішчэлі яны, як медзь
блішчастая.
8 Пад крыламі іхнімі [былі] рукі людзкія па чатырох баках іхніх. Абліччы і крылы [былі] ў-ва
ўсіх чатырох.
9 І крылы іхнія прылягалі адны да другіх, і яны не адварочваліся, калі ішлі; кожная [істота]
ішла проста перад абліччам сваім.
10 Абліччы іхнія выглядалі як аблічча чалавека і аблічча ільва з правага боку чатырох [істотаў],
і як аблічча вала з левага боку чатырох [істотаў], і як аблічча арла ў чатырох [істотаў].
11 Абліччы іхнія і крылы іхнія былі скіраваныя ўгару, два [крылы] прылягалі адзін да аднаго,
а два акрывалі целы іхнія.
12 І кожная [істота] ішла [проста] перад аблічча сваё, яны ішлі туды, куды іх Дух вёў, і ідучы,
не адварочваліся ў хадзе сваёй.
13 А выгляд тых [істотаў] жывых — быццам гарачыя вуглі распаленыя, падобныя да паходняў,
якія рухаюцца між тымі [істотамі] жывымі. Агонь зьзяў, і з агню выходзілі маланкі.
14 І [істоты] жывыя ішлі і варочаліся назад, нібы маланкі.
15 І я бачыў тыя [істоты] жывыя, а вось, адно кола на зямлі пры кожнай з тых чатырох [істотаў]
жывых.
16 Выгляд тых колаў і выраб іхні — як выгляд хрызаліту, і ўсе чатыры мелі той самы выгляд, і
выгляд іхні і выраб, нібыта адно кола было ў другім.
17 Яны ішлі ў хадзе сваёй на чатыры бакі; а калі ішлі, не адварочваліся ў хадзе сваёй.
18 Абруч іхні быў велізарны; і выгляд іх і абручоў іхніх у-ва ўсіх чатырох быў поўны вачэй
кругом.
19 А калі ішлі гэтыя [істоты] жывыя, ішлі колы іхнія разам з імі. Калі [істоты] падымаліся з
зямлі, падымаліся таксама колы.
20 Куды кіраваў іх Дух, каб ішлі, яны ішлі туды, куды Дух [хацеў] ісьці, і колы падымаліся з імі,
бо дух [істоты] жывой [быў] у колах.
21 Калі рухаліся [істоты], рухаліся [колы], а калі спыняліся, і [колы] спыняліся; калі яны
падымаліся з зямлі, і колы падымаліся, бо дух [істотаў] жывых [быў] у колах.
22 Над галовамі гэтых [істотаў] жывых было штосьці, быццам прасьцяг неба, быццам
крышталь, які ірдзее, раскінуты над галовамі іхнімі ўгары.
23 А пад прасьцягам былі ўзьнятыя крылы іхнія, адно побач другога; і кожная [істота] мела па
два [крылы], якімі закрывалі целы свае.
24 Калі яны ішлі, чуўся шум крылаў іхніх, як шум мноства водаў, як голас Усемагутнага, голас
гоману, як гармідар табару [вайсковага]; а калі яны спыняліся, крылы мелі апушчаныя.
25 І быў голас па-над прасьцягам, які быў над галовамі іхнімі. А калі яны спыняліся, крылы
мелі апушчаныя.
26 А па-над прасьцягам, які быў над галовамі іхнімі, было штосьці, падобнае да пасаду, што
мела выгляд камяня шафіру, і на тым падабенстве пасаду — быццам постаць чалавека на ім
угары.

27 І ўбачыў я нібыта бляск бурштыну і нібыта выгляд агню ўнутры яго наўкола, [пачынаючы]
ад таго, што выглядала як сьцёгны, і вышэй. А ўніз ад таго, што выглядала як сьцёгны, бачыў
я штосьці, як агонь, і бляск вакол яго.
28 Як зьяўленьне вясёлкі на воблаках у дзень дажджлівы, такі быў выгляд бляску таго наўкола.
Ён [меў] выгляд, падобны да славы ГОСПАДА. І я ўбачыў яе, і ўпаў на аблічча маё, і пачуў голас,
які прамаўляў.

Эзк 2

1 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, стань на ногі твае. Я буду прамаўляць да цябе».
2 І ўвайшоў у мяне дух, калі Ён прамаўляў да мяне, і паставіў мяне на ногі мае, і я чуў, як Ён
прамаўляў да мяне,
3 і сказаў мне: «Сыне чалавечы, Я пасылаю цябе да сыноў Ізраіля, да народу бунтаўнікоў, якія
бунтуюцца супраць Мяне; яны і бацькі іхнія выступаюць супраць Мяне да дня сёньняшняга.
4 Гэта сыны з абліччамі бяз сораму і сэрцамі закамянелымі. Я пасылаю цябе да іх, і ты скажаш
ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД”.
5 А ці паслухаюць яны цябе, ці адмовяцца, бо яны — дом бунтаўнікоў, але будуць ведаць, што
прарок ёсьць сярод іх.
6 А ты, сыне чалавечы, ня бойся іх і ня бойся словаў іхніх, хоць яны вакол цябе — асот і церні,
і ты сядзіш сярод скарпіёнаў. Ня бойся словаў іхніх і ня бойся абліччаў іхніх, бо яны — дом
бунтаўнікоў.
7 І ты прамовіш да іх словы Мае, ці будуць яны слухаць, ці адмовяцца, бо яны — бунтаўнікі.
8 А ты, сыне чалавечы, слухай, што Я прамаўляю да цябе, і ня будзь бунтаўніком, як гэты дом
бунтаўнічы. Адчыні вусны твае і зьеш тое, што Я дам табе».
9 І я ўбачыў, і вось, рука, выцягнутая да мяне, і вось, у ёй — скрутак кнігі.
10 І Ён разгарнуў яго перад абліччам Маім; а быў ён запісаны з аднаго і другога боку, і былі ў
ім запісаныя лямант, уздыханьне і бедаваньне.

Эзк 3

1 І сказаў Ён мне: «Сыне чалавечы, зьеш тое, што знайшоў, зьеш скрутак гэты, і ідзі прамаўляць
да дому Ізраіля».
2 І я адчыніў вусны мае, і Ён даў мне зьесьці скрутак гэты,
3 і сказаў мне: «Сыне чалавечы, накармі жывот твой і напоўні нутро тваё скруткам гэтым, які
Я даю табе». І я зьеў яго, і быў ён у вуснах маіх салодкі, як мёд.
4 І сказаў Ён мне: «Сыне чалавечы, ідзі да дому Ізраіля і прамаўляй да іх словамі Маімі.
5 Бо ты пасланы не да народу з цяжкім языком і чужой мовай, але да дому Ізраіля.
6 Не да мноства народаў з чужой мовай і цяжкім языком, што ты не разумееш словаў іхніх.
Калі б да іх Я паслаў цябе, яны б слухалі цябе.
7 Аднак дом Ізраіля не захоча слухаць цябе, бо яны ня хочуць слухаць Мяне; бо ўвесь дом
Ізраіля мае цьвёрды лоб і закамянелае сэрца.
8 Вось, Я даў [табе] аблічча тваё цьвярдзейшае, чым абліччы іхнія, і лоб твой цьвярдзейшы,
чым ілбы іхнія.
9 Як той дыямэнт, цьвярдзейшы ад крэменя, Я даў [табе] лоб твой. Ня бойся іх і не палохайся
аблічча іхняга, бо яны — дом бунтаўнікоў».
10 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, усе словы Мае, якія Я прамаўляў да цябе, вазьмі ў сэрца
тваё, і слухай вушамі тваімі.
11 І ідзі да выгнанцаў, да сыноў народу твайго, і прамаўляй да іх, і кажы ім: “Гэта кажа Госпад
ГОСПАД”, ці будуць яны слухаць, ці адмовяцца».
12 І падхапіў мяне дух, і я пачуў за сабой голас грымоту вялікага: «Дабраслаўлёная слава
ГОСПАДА», [калі яна падымалася] з месца свайго,
13 і шум крылаў [істотаў] жывых, якія біліся адно аб адно, і гук колаў разам з імі, і голас
грымоту вялікага.

14 І дух падняў мяне, і забраў мяне; і я пайшоў раздражнёны і зьбянтэжаны ў духу маім, а
дужая рука ГОСПАДА [была] на мне.
15 І я прыйшоў да выгнанцаў у Тэль-Авіве, якія жылі над ракою Кевар, і сядзеў там, дзе яны
сядзяць, і жыў там сем дзён сярод іх аслупянелы.
16 І сталася, калі мінула сем дзён, было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
17 «Сыне чалавечы, Я паставіў цябе вартаваць дом Ізраіля. І ты пачуеш слова з вуснаў Маіх, і
папярэдзіш іх ад Мяне.
18 Калі Я скажу бязбожніку: “Ты сьмерцю памрэш”, а ты яго не перасьцеражэш і ня будзеш
казаць [яму], каб адвесьці бязбожніка ад бязбожнага шляху ягонага, каб ён жыў, бязбожнік
той памрэ за беззаконьні свае, але Я буду шукаць на руках тваіх кроў ягоную.
19 А калі ты перасьцеражэш бязбожніка, але ён не адвернецца ад бязбожнасьці сваёй і ад шляху
бязбожнага свайго, ён памрэ за беззаконьні свае, а ты збавіш душу тваю.
20 Калі праведнік адступіць ад праведнасьці сваёй і ўчыніць грэх, Я дам спатыкненьне перад
абліччам ягоным, і ён памрэ, бо ты не перасьцярог яго. За грэх свой ён памрэ, і праведнасьць,
якую ён рабіў, ня будзе ўзгадана, але кроў ягоную Я буду шукаць на руках тваіх.
21 А калі ты перасьцеражэш праведніка, каб праведнік не грашыў, і калі ён не саграшыць, ён
будзе жыць, бо прыняў перасьцярогу, а ты збавіш душу тваю».
22 І была там на мне рука ГОСПАДА, і Ён сказаў мне: «Устань, выйдзі ў даліну, там Я буду
прамаўляць да цябе».
23 І я ўстаў, і пайшоў у даліну, і вось, там [была] слава ГОСПАДА, такая, як слава, якую я бачыў
над ракою Кевар. І я ўпаў на аблічча маё.
24 І ўвайшоў у мяне дух, і паставіў мяне на ногі мае. І Ён прамовіў да мяне, і сказаў: «Ідзі,
зачыніся ў сярэдзіне дому твайго.
25 І вось, сын чалавечы, будуць ускладзеныя на цябе вяроўкі, і ты будзеш зьвязаны імі, і ня
выйдзеш спасярод іх.
26 І язык твой Я прыляплю да паднябеньня твайго, і будзеш ты нямы. І ня будзеш для іх
чалавекам, які дакарае, бо яны — дом бунтаўнікоў.
27 Калі Я буду прамаўляць да цябе, Я адкрыю вусны твае, і ты скажаш ім: “Гэта кажа Госпад
ГОСПАД”. Хто хоча слухаць, няхай слухае, а хто адмаўляецца, той няхай адмаўляецца, бо гэта
дом бунтаўнікоў.

Эзк 4

1 А ты, сын чалавечы, вазьмі таблічку гліняную, пакладзі яе перад абліччам тваім і накрэсьлі
на ёй горад Ерусалім.
2 І пастаў аблогу супраць яго, пабудуй мур супраць яго, насып вал супраць яго, пастаў супраць
яго табар, пастаў супраць яго тараны кругом.
3 І вазьмі сабе патэльню жалезную, і палажы яе нібы мур жалезны паміж табою і горадам, і
павярні аблічча тваё на яго. І будзе ён абляганы, і ты будзеш аблягаць яго. Гэта будзе знак для
дому Ізраіля.
4 І ты ляж на левым баку тваім, і складзі на ім беззаконьні дому Ізраіля. Столькі дзён, колькі
будзеш ляжаць на [баку], будзеш несьці беззаконьні іхнія.
5 І Я вызначыў табе гады беззаконьня іхняга паводле ліку дзён: трыста дзевяноста дзён будзеш
несьці беззаконьне дому Ізраіля.
6 А калі іх скончыш, ляжаш тады на правым баку тваім і будзеш несьці беззаконьні дому Юды
сорак дзён, і Я вызначыў табе дзень за адзін год.
7 І на абложаны Ерусалім звернеш аблічча тваё і аголенае рамяно тваё, і будзеш прарочыць
супраць яго.
8 І вось, Я накладаю на цябе путы, і ты не павернешся з аднаго боку на другі, пакуль ня скончыш
дзён аблогі тваёй.

9 І ты вазьмі сабе пшаніцы і ячменю, бобу і сачэвіцы, проса і чарнухі, і ўсё ўкладзі ў адзін посуд,
і зрабі сабе з гэтага хлеб. Будзеш яго есьці столькі дзён, колькі будзеш ляжаць на баку тваім,
трыста дзевяноста дзён будзеш есьці яго.
10 А тая ежа, якую будзеш есьці, [будзе] важыць дваццаць сыкляў на дзень; час ад часу будзеш
есьці яе.
11 І ваду ашчадна будзеш піць: будзеш піць час ад часу адну шостую гіну.
12 Будзеш гэта есьці як аладку ячменную, і будзеш пячы гэта на вачах іхніх на гною
чалавечым».
13 І сказаў ГОСПАД: «Гэтак будуць есьці сыны Ізраіля свой хлеб нячысты сярод народаў, сярод
якіх Я расьцярушу іх».
14 І я сказаў: «О Госпадзе ГОСПАДЗЕ, вось, душа мая [ніколі] не апаганьвалася, ад маладосьці
маёй аж да цяпер я ня еў ані падліны, ані таго, што было разьдзёртае; і не ўваходзіла ў вусны
мае мяса нячыстае».
15 І Ён сказаў мне: «Глядзі, Я даю табе гной кароўскі замест гною чалавечага, і ты будзеш рабіць
хлеб твой на ім».
16 І сказаў мне: «Сыне чалавечы, вось, Я зламлю падпору хлеба ў Ерусаліме, і будуць яны есьці
хлеб паводле вагі і са страхам, і будуць піць ваду паводле меры і са смуткам,
17 каб, [маючы] нястачу хлеба і вады, жахаліся адзін аднаго і гнілі ў грахах сваіх.

Эзк 5

1 А ты, сын чалавечы, вазьмі сабе меч востры і скарыстай яго як лязо, і пагалі сабе ім галаву і
бараду. І вазьмі шалі вагаў, і падзялі тыя [валасы].
2 Трэцюю частку іх спаліш у агні пасярод гораду, калі прыйдуць дні аблогі; і возьмеш трэцюю
частку, і пасячэш яе мячом кругом [гораду], і трэцюю частку раскідаеш з ветрам, бо Я выцягну
на іх меч.
3 І возьмеш з іх малую толькі частку і ўкруціш у крысо плашча твайго.
4 І возьмеш яшчэ з іх [крыху], і ўкінеш у агонь, каб у ім згарэлі, і выйдзе з гэтага агонь на ўвесь
дом Ізраіля».
5 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: «Гэты Ерусалім Я паставіў сярод народаў, а вакол яго — землі
[чужынскія].
6 Але ён пагардзіў судом Маім, і бязбожнасьць [ягоная] большая, чым у народаў, і ён [паўстаў]
супраць пастановаў Маіх больш, чым землі, якія вакол яго, бо яны адкінулі прысуды Мае і не
хадзілі паводле пастановаў Маіх.
7 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што вы збунтаваліся [больш], чым народы,
якія вакол вас, і не хадзілі паводле пастановаў Маіх, і не выконвалі прысуды Мае, і нават не
трымаліся судоў народаў, якія вакол вас,
8 вось, гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я — супраць цябе, і на вачах народаў Я зраблю над
табою суд.
9 І зраблю табе за ўсе брыдоты твае тое, чаго ніколі не рабіў, і ўжо ніколі не зраблю падобнага.
10 Дзеля гэтага бацькі будуць есьці сыноў пасярод цябе, а сыны будуць есьці бацькоў сваіх, і Я
ўчыню над табою суды, і расьцярушу ўсю рэшту тваю на ўсе вятры”.
11 Дзеля гэтага, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, за тое, што ты сьвятыню Маю апаганіў усімі
брыдотамі тваімі і ўсімі агідамі тваімі, Я таксама адкіну цябе, і ня будзе мець літасьці вока
Маё, і не пашкадую [цябе].
12 Трэцяя частка твая памрэ ад заразы і загіне пасярод цябе ад голаду; трэцяя частка ўпадзе
ад мяча ў ваколіцах тваіх; і трэцюю частку Я расьцярушу на ўсе вятры, і выцягну на іх меч.
13 І супакоіцца гнеў Мой, і Я задаволю на іх лютасьць Маю, і супакоюся. І даведаюцца яны, што
Я, ГОСПАД, прамовіў гэта ў гневе Маім, калі выльлю гнеў Мой на іх.
14 І Я зраблю цябе спусташэньнем і ганьбаю сярод народаў, якія вакол цябе, на вачах усіх
мінакоў.
15 І ты станешся ганьбаю і пасьмешышчам, перасьцярогай і пусткаю для народаў, якія вакол
цябе, калі Я ўчыню супраць цябе суды ў гневе і лютасьці і ярасным пакараньні. Я, ГОСПАД,
прамовіў гэта.

16 Калі Я пашлю супраць вас стрэлы голаду, каб нішчыць вас, калі іх пашлю для загубы вашай,
Я памножу паміж вамі голад і зламлю вам падпору хлеба.
17 І Я спашлю на вас голад і дзікіх зьвяроў, і яны асіроцяць цябе; і зараза, і кроў прыйдуць на
цябе, і Я прывяду на цябе меч. Я, ГОСПАД, прамовіў гэта».

Эзк 6

1 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на горы Ізраіля і прароч супраць іх,
3 і кажы: “Горы Ізраіля, слухайце слова Госпада ГОСПАДА. Гэта кажа Госпад ГОСПАД гарам і
ўзгоркам, ярам і лугам. Вось, Я прывяду на вас меч і зьнішчу ўзгоркі вашыя,
4 і будуць зруйнаваныя ахвярнікі вашыя і паразьбіваныя слупы вашыя, і Я кіну забітых вашых
перад ідаламі вашымі.
5 І Я палажу трупы сыноў Ізраіля перад ідаламі вашымі, і косткі вашыя параскідаю вакол
ахвярнікаў вашых.
6 У-ва ўсіх месцах пражываньня вашага гарады будуць зруйнаваныя, узгоркі зьнішчаныя,
ахвярнікі вашыя будуць апаганеныя і зруйнаваныя, ідалы вашыя паразьбіваныя і панішчаныя,
а слупы вашыя паламаныя, і згінуць усе справы вашыя.
7 І будуць падаць сярод вас забітыя, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
8 Але Я пакіну вам пры жыцьці сярод народаў тых, якія выратуюцца ад мяча, калі расьцярушу
вас сярод земляў [чужых].
9 Тыя, што застануцца пры жыцьці, будуць памятаць пра Мяне сярод народаў, куды будуць
пераселеныя, бо Я скрышу сэрца іхняе чужаложнае, якое адступіла ад Мяне, і вочы іхнія, якія
чужаложаць з ідаламі. І яны будуць брыдзіцца самімі сабою дзеля бязбожнасьці, якую чынілі
ў-ва ўсіх брыдотах сваіх.
10 І даведаюцца яны, што Я — ГОСПАД, і [што] не дарма Я прамаўляў да іх, што ўчыню супраць
іх гэтае ліха”.
11 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Ударай у далоні твае, і тупай нагою тваёй, і кажы: "Гора дзеля
ўсякіх брыдотаў ліхіх дому Ізраіля, бо будуць яны падаць ад мяча, голаду і заразы".
12 Той, які далёка, — памрэ ад заразы; той, які блізка, — загіне ад мяча, а той, што застанецца
[ў горадзе] і будзе выратаваны, — памрэ ад голаду. І Я заспакою лютасьць Маю на іх.
13 І вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД, калі забітыя вашыя будуць [ляжаць] паміж ідалаў вашых,
вакол ахвярнікаў вашых, на кожным узгорку высокім, на ўсіх вяршынях горных, пад кожным
дрэвам зялёным і пад кожным рассахатым дубам, дзе складалі вы пахкія каджэньні ўсім
ідалам сваім.
14 І Я выцягну руку Маю супраць іх, і перамяню зямлю гэтую ў бязьлюдзьдзе і пустэчу, ад
пустыні аж да Рыўлі, у-ва ўсіх месцах пражываньня іхняга, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД”».

Эзк 7

1 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
2 «А ты, сыне чалавечы, [слухай]. Гэта кажа Госпад ГОСПАД да зямлі Ізраіля. Канец
прыходзіць, канец для чатырох краёў зямлі.
3 Цяпер [прыходзіць] канец на цябе. І Я пашлю гнеў Мой супраць цябе, і буду судзіць цябе
паводле шляхоў тваіх, і залічу табе ўсе брыдоты твае.
4 І не пашкадуе цябе вока Маё, і ня зьлітуюся, але ўскладу на цябе шляхі твае, і брыдоты твае
стануць пасярод цябе, і даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
5 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, надыходзіць адно ліха, [за ім] другое ліха”.
6 Прыходзіць канец, прыходзіць канец. Канец для цябе. Вось, ён прыйшоў.
7 Прыйшла доля твая, жыхару зямлі. Надыйшоў час. Блізкі дзень гора, і няма крыку радасьці
на гарах.
8 Цяпер Я выльлю неўзабаве лютасьць Маю на цябе, заспакою гнеў Мой на табе. І Я асуджу цябе
паводле шляхоў тваіх, і ўскладу на цябе ўсе брыдоты твае.

9 І ня будзе мець літасьці вока Маё, і не пашкадуе, паводле шляхоў тваіх ускладу на цябе
[адплату], і брыдоты твае будуць выяўлены пасярод цябе, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД,
Які карае.
10 Вось, дзень гэты, вось, ён прыходзіць. Выйшла доля [твая], заквітнеў кій, запанавала пыха,
11 падняўся гвалт і [стаўся] кіем бязбожнасьці. Нічога з іх [не застанецца], нічога з багацьцяў
іхніх, нічога з гоману іхняга, нічога з узьнёсласьці іхняй.
12 Прыходзіць час, набліжаецца дзень. Хто купляе, няхай ня цешыцца, і хто продае, няхай не
сумуе, бо [надыходзіць] лютасьць на ўсю грамаду ягоную.
13 Бо той, хто продае, да праданага ня вернецца, нават калі застанецца пры жыцьці, бо відзеж
пра грамаду іхнюю ня будзе адменены і ніхто ў беззаконьні сваім не ўтрымае жыцьцё сваё.
14 Трубіце ў трубы, падрыхтуйцеся ўсе, але няма нікога, хто б ішоў ваяваць; бо гнеў Мой — на
ўсю грамаду ягоную.
15 Меч звонку, а зараза і голад у сярэдзіне. Хто на полі, той загіне ад мяча, а хто ў горадзе, таго
голад і зараза загубіць.
16 І ўратуюцца тыя, што ўцяклі, і будуць на гарах як галубы з даліны, будуць стагнаць кожны
дзеля беззаконьня свайго.
17 Усе рукі памлеюць, і ўсе калені задрыжаць, як вада.
18 І падпярэжуцца яны зрэбніцай, і апануе іх страх, і на ўсіх абліччах [будзе] сорам, і на ўсіх
галовах іхніх — лысіна.
19 Срэбра сваё яны выкінуць на вуліцу, а золата іхняе станецца як сьмецьце. Срэбра іхняе і
золата іхняе ня змогуць уратаваць іх у дзень гневу ГОСПАДА, бо душы сваёй [ім] не насыцяць,
і нутро сваё не напоўняць, бо яно было для іх прычынай беззаконьня іхняга.
20 Аздобныя ўпрыгожваньні іхнія напоўнілі іх пыхлівасьцю, і з іх яны зрабілі брыдоты свае,
ідалапаклонства сваё ўчынілі з іх. Таму Я замяню іх у нячыстасьць для іх,
21 і аддам іх у рукі чужынцаў на здабычу, бязбожным зямлі — на рабаваньне, і яны зьняславяць
іх.
22 І Я адвярну ад іх аблічча Маё, і скарб Мой будзе зьняслаўлены. І ўвойдуць да яго рабаўнікі,
і зьняславяць яго.
23 Зрабі [сабе] ланцугі; бо зямля поўная судоў крывавых, а горад поўны гвалту.
24 І Я прывяду жахлівыя народы, і яны возьмуць дамы іхнія. І Я спыню пыхлівасьць
вяльможных, і будуць апаганеныя сьвятыні іхнія.
25 Жах надыходзіць. І будуць яны шукаць супакою, і ня будзе [яго].
26 Бяда за бядою прыходзяць, вестка за весткай ідуць. І будуць шукаць відзежу ў прарока, і ня
будзе Закону ў сьвятара, і [ня будзе] рады ў старшыняў.
27 Валадар будзе ў жалобе, князь перапоўніцца замяшаньнем, і рукі народу зямлі гэтай будуць
дрыжаць. Я зраблю ім паводле шляхоў іхніх і паводле судоў іхніх буду судзіць іх. І даведаюцца,
што Я — ГОСПАД».

Эзк 8

1 І сталася ў шостым годзе, у пятым [дні] шостага месяца, сядзеў я ў доме маім, і старшыні
Юды сядзелі перад абліччам маім, і супачыла там на мне рука Госпада ГОСПАДА.
2 І я паглядзеў, і вось, быў там [Нехта], падобны да выгляду [чалавека] вогненнага; і ўніз ад
выгляду сьцёгнаў ягоных — агонь, а ўгару ад выгляду сьцёгнаў ягоных — выгляд зьзяньня як
выгляд бурштыну.
3 І выцягнуў Ён быццам руку, і схапіў мяне за валасы галавы маёй, і Дух падняў мяне ўгару
паміж зямлёй і небам, і ў відзежах Божых завёў у Ерусалім у прысенак брамы ўнутранай,
зьвернутай на поўнач, там, дзе месца знаходжаньня ідала зайздрасьці, які выклікае гнеў
[Божы].
4 І вось, там слава Бога Ізраіля, такая, якую я бачыў у даліне.
5 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, падымі вочы твае ў накірунку на поўнач!» І я падняў вочы
мае ў накірунку на поўнач, і вось, на поўнач ад брамы ахвярніка [быў] каля ўваходу той ідал
зайздрасьці.

6 І сказаў Ён мне: «Сыне чалавечы, ці ты бачыш, што яны робяць? Брыдоты вялікія, якія робіць
тут дом Ізраіля, каб змусіць Мяне аддаліцца ад сьвятыні Маёй. І калі зноў прыгледзішся,
убачыш брыдоты вялікія».
7 І Ён завёў мяне да ўваходу ў панадворак, і я прыгледзеўся, і вось, дзіра ў муры.
8 І Ён сказаў мне: «Сын чалавечы, прабі мур гэты!» І я прабіў мур, і вось, праход.
9 І Ён сказаў мне: «Увайдзі і паглядзі на тыя брыдоты ліхія, якія яны робяць тут!»
10 І я ўвайшоў і глядзеў, і вось, усякія выявы паўзуноў і жывёлаў агідных і ўсе ідалы дому
Ізраіля намаляваныя ўсюды кругом на сьцяне.
11 І семдзясят мужоў спасярод старшыняў дому Ізраіля стаялі перад імі, і між імі Яазанія, сын
Шафана; і ў руцэ сваёй кожны меў кадзільніцу сваю, і пах узносіўся з воблакаў кадзіла.
12 І Ён сказаў мне: «Ці ты бачыш, сыне чалавечы, што робіць у цемры кожны са старшыняў
дому Ізраіля, кожны ў таемным пакоі ідалаў сваіх? Бо яны кажуць: “ГОСПАД ня бачыць нас.
ГОСПАД пакінуў зямлю гэтую”».
13 І Ён сказаў мне: «Калі прыгледзішся, убачыш брыдоты вялікія, якія яны робяць».
14 І Ён завёў мяне ў прысенак брамы Дому ГОСПАДА, які на поўначы, і вось, сядзелі там
жанчыны і плакалі па Тамузе.
15 І Ён сказаў мне: ”Ці ты бачыш, сыне чалавечы? Калі прыгледзішся, убачыш брыдоты яшчэ
большыя ад гэтых».
16 І Ён завёў мяне на ўнутраны панадворак Дому ГОСПАДА, і вось, каля ўваходу ў сьвятыню
ГОСПАДА, паміж прысенкам і ахвярнікам, — каля дваццаці пяці мужчынаў, сьпіны іхнія
[павернутыя] да сьвятыні ГОСПАДА, а абліччы іхнія — на ўсход, і яны пакланяліся на ўсход,
[пакланяліся] сонцу.
17 І Ён сказаў мне: «Ці ты бачыш, сыне чалавечы? Ці ня досыць дому Юды чыніць брыдоты
гэтыя, якія яны тут робяць? Бо яны напаўняюць зямлю гэтую гвалтам і зноў абражаюць Мяне.
І вось, яны падымаюць галінку да носу свайго.
18 І Я таксама пастаўлюся да іх з лютасьцю, ня будзе мець літасьці вока Маё, і не пашкадую [іх].
І будуць клікаць у вушы Мае голасам моцным, але Я ня выслухаю іх».

Эзк 9

1 І Ён закрычаў голасам моцным у вушы мае, кажучы: «Прыходзьце, вартаўнікі гораду, і няхай
кожны мае ў руцэ сваёй зброю».
2 І вось прыйшлі шэсьць мужоў дарогай ад верхняе брамы, якая на поўначы, кожны са зброяй
сваёй у руцэ; між імі быў адзін чалавек, апрануты ў ільняную шату, з прыладай пісарскай пры
боку. І ўвайшлі яны, і затрымаліся перад ахвярнікам мядзяным.
3 А слава Бога Ізраіля паднялася з-над херувімаў, на якіх знаходзілася, да парогу сьвятыні.
Пасьля, паклікаўшы чалавека, апранутага ў ільняную шату, які меў прыладу пісарскую пры
боку,
4 ГОСПАД сказаў яму: «Прайдзі праз сярэдзіну гораду, праз сярэдзіну Ерусаліму і напішы гэты
знак “таў” на чолах мужчынаў, якія ўздыхаюць і бядуюць з прычыны ўсіх тых брыдотаў, якія
ў ім робяцца».
5 А да іншых сказаў так, што і я чуў: «Ідзіце за ім па горадзе і забівайце. Няхай вочы вашыя ня
ведаюць ані спачуваньня, ані літасьці.
6 Старога, юнака, дзяўчыну, немаўля і жанчыну забівайце, але не дакранайцеся да кожнага
мужа, на якім будзе той знак. І пачынайце ад сьвятыні Маёй». І пачалі яны ад тых старшыняў,
якія стаялі перад сьвятыняй.
7 І сказаў Ён ім: «Апаганьце таксама сьвятыню, і панадворкі ейныя закідайце трупамі!» І
выйшлі яны, і забівалі ў горадзе.
8 А ў той час, калі яны забівалі, я застаўся сам, упаў на аблічча маё і так маліўся ўголас:
«Госпадзе, ГОСПАДЗЕ! Ці Ты хочаш вынішчыць усю рэшту Ізраіля, выліваючы гнеў Свой на
Ерусалім?»

9 І сказаў Ён мне: «Беззаконьне дому Ізраіля і Юды вельмі, вельмі вялікае, зямля поўная крыві,
а горад напоўнены няпраўдаю, бо яны кажуць: “ГОСПАД пакінуў зямлю гэтую. ГОСПАД ня
бачыць”.
10 Таксама вока Маё ня будзе мець ані літасьці, ані спачуваньня. Шляхі іхнія Я ўскладу на
галовы іхнія».
11 І вось той чалавек, апрануты ў ільняную вопратку, з прыладай пісарскай пры боку,
паведаміў: «Я зрабіў, як Ты загадаў мне».

Эзк 10

1 І я глядзеў, і вось над прасьцягам, раскінутым над галовамі херувімаў, было штосьці, быццам
шафір, а з выгляду падобнае да пасаду.
2 І Ён сказаў чалавеку гэтаму, апранутаму ў ільняную шату: «Увайдзі паміж колаў пад
херувімамі, і напоўніўшы далоні свае вугольлем агністым з месца паміж херувімамі, раскінь
яго па горадзе». І ён увайшоў туды на вачах маіх.
3 А херувімы стаялі з правага боку сьвятыні, калі чалавек той туды ўваходзіў, і воблака
запоўніла ўнутраны панадворак.
4 І слава ГОСПАДА паднялася з-над херувімаў да парогу сьвятыні, і сьвятыня напоўнілася
воблакам, а панадворак быў поўны бляску славы ГОСПАДА.
5 І быў чуцён шум крылаў херувімаў аж на вонкавым панадворку, падобны да голасу Бога
Усемагутнага, калі Ён прамаўляе.
6 А калі чалавеку таму, апранутаму ў ільняную шату, Ён даў такі загад: «Вазьмі агонь спаміж
колаў, спаміж херувімаў», — той пайшоў і стаў побач з коламі.
7 Тады адзін з херувімаў выцягнуў руку ў накірунку агню, які між херувімамі, і, узяўшы яго,
паклаў на далоні чалавека, апранутага ў ільняную шату. Той узяў [агонь] і выйшаў.
8 А пад крыламі херувімаў зьявілася нешта накшталт рукі чалавечай.
9 Я глядзеў, і вось, пры боку херувімаў чатыры колы, па адным коле побач кожнага херувіма.
Выгляд тых колаў — нібы бляск хрызаліту.
10 І выглядалі яны так, нібы кожнае з чатырох мела тую самую форму, і быццам адно кола
знаходзілася ў другім.
11 І калі яны рухаліся, рухаліся ў чатырох сваіх напрамках, не адварочваліся, калі рухаліся ў
тым напрамку, куды вяла іх галава, і рухаліся за ёй, і не адварочваліся, калі рухаліся.
12 Усё іх цела, плечы, рукі, крылы і колы ў-ва ўсіх чатырох былі запоўненыя кругом вачыма.
13 І я чуў, што колам была дадзена назва “гальгаль”.
14 Кожная [істота] жывая мела па чатыры аблічча. Першае было аблічча вала, другое —
аблічча чалавека, трэцяе — аблічча ільва, а чацьвёртае — аблічча арла.
15 І падняліся херувімы. І была гэта тая самая істота, якую я бачыў над ракою Кевар.
16 Калі херувімы ішлі, рухаліся таксама пры боку іхнім колы, а калі херувімы падымалі крылы,
каб падняцца з зямлі, колы не адрываліся ад боку іхняга.
17 Калі херувімы затрымліваліся, таксама і яны затрымліваліся, а калі падымаліся,
падымаліся таксама і яны разам з імі, бо дух [істоты] жывой быў у іх.
18 І адыйшла слава ГОСПАДА ад парогу сьвятыні, і затрымалася над херувімамі.
19 І херувімы ўзьнялі крылы, і паляцелі, і падняліся з зямлі на вачах маіх, і тыя колы разам
з імі, і затрымаліся каля ўваходу ўсходняй брамы сьвятыні ГОСПАДА, і слава Бога Ізраіля
супачывала над імі ўгары.
20 Была гэта тая самая [істота] жывая, якую я бачыў пад Богам Ізраіля над ракою Кевар, і я
даведаўся, што гэта былі херувімы.
21 Кожны з іх меў чатыры аблічча і чатыры крылы, а пад крыламі — штосьці накшталт рук
чалавечых.
22 Выгляд абліччаў іхніх быў падобны да тых самых абліччаў, якія я бачыў над ракою Кевар.
Кожны рухаўся проста перад сабою.

Эзк 11

1 І падняў мяне дух, і занёс да ўсходняй брамы сьвятыні ГОСПАДА, зьвернутай на ўсход. І вось,
каля ўваходу ў браму былі дваццаць пяць мужоў, сярод якіх я ўбачыў Яазанію, сына Азура, і
Пэлятыю, сына Бэнаі, начальнікаў народу.
2 І сказаў мне ГОСПАД: «Сыне чалавечы, вось мужы, у думках якіх ліхота і якія ў гэтым горадзе
распаўсюджваюць рады ліхія.
3 Яны гавораць: “Ня хутка [суд]; будуйма дамы. Вось, [горад] — кацёл, а мы — мяса”.
4 Дзеля гэтага прароч супраць іх, прароч, сын чалавечы!»
5 І зыйшоў на мяне Дух ГОСПАДА, і сказаў мне: «Кажы: “Гэта кажа ГОСПАД. У такі спосаб вы
кажаце, дом Ізраіля, і Я ведаю, што робіцца ў душы вашай.
6 Вы памножылі забітых вашых у горадзе гэтым, і вуліцы ягоныя напоўнілі забітымі.
7 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "Забітыя вашыя, якіх вы паклалі ў сярэдзіне яго, —
гэта мяса, а [горад] — кацёл. А вы будзеце выкінутыя з сярэдзіны яго".
8 Вы баіцёся мяча, а Я прывяду на вас меч, кажа Госпад ГОСПАД.
9 І Я выганю вас з яго сярэдзіны, і аддам вас у рукі чужынцам, і правяду суд над вамі.
10 Вы ўпадзеце ад мяча, і Я буду судзіць вас на мяжы Ізраіля, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
11 [Горад] ня будзе для вас катлом, а вы ня будзеце ў ім мясам. На мяжы Ізраіля Я буду судзіць
вас.
12 І вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД, бо не жылі вы паводле пастановаў Маіх, і прысуды Мае
не спаўнялі, але рабілі паводле прысудаў тых народаў, якія вакол вас”»
13 І сталася, калі я прарочыў, памёр Пэлятыя, сын Бэнаі. І ўпаў я на аблічча маё, і закрычаў
моцным голасам, і сказаў: «О, Госпадзе ГОСПАДЗЕ! Няўжо Ты зьнішчыш рэшту Ізраіля».
14 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
15 «Сыне чалавечы, да братоў тваіх, да братоў тваіх, да выгнаных з табой, да ўсяго дому Ізраіля
кажуць жыхары Ерусаліму: “Далёкія вы ад ГОСПАДА. Нам дадзена зямля гэтая на ўласнасьць”.
16 Дзеля гэтага кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Я выгнаў іх да народаў і расьцярушыў па
[розных] землях, і праз кароткі [час] буду для іх сьвятыняй у землях, куды яны прыйшлі”.
17 Дзеля гэтага кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Я зьбяру вас з народаў, зграмаджу вас з тых
земляў, у якіх вы расьцярушаны, і дам вам зямлю Ізраіля.
18 І яны вернуцца туды, і прыбяруць з яе ўсе агіды ейныя і ўсе брыдоты ейныя.
19 І Я дам ім адно сэрца, і духа новага дам у нутро іхняе, і выкіну сэрца каменнае з цела іхняга,
і дам ім сэрца цялеснае,
20 каб хадзілі паводле пастановаў Маіх і суд Мой захоўвалі і спаўнялі яго, і будуць для Мяне
народам, а Я буду для іх Богам.
21 А тых, у каго сэрца схіляецца да ідалаў і брыдотаў, на галовы іхнія Я ўскладу шляхі іхнія,
кажа Госпад ГОСПАД”».
22 І ўзьнялі херувімы крылы свае, і колы [рушылі] з імі, а слава Бога Ізраіля [была] на іх угары.
23 І адыйшла слава ГОСПАДА з сярэдзіны гораду, і затрымалася на гары, якая на ўсход ад
гораду.
24 І дух падняў мяне і занёс мяне ў Халдэю да выгнанцаў у відзежы Духу Божага. І спыніўся
відзеж, які я бачыў.
25 І я прамовіў да выгнанцаў усе словы ГОСПАДА, якія Ён мне паказаў.

Эзк 12

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, ты жывеш сярод дому бунтаўнікоў, які [мае] вочы, каб бачыць, а ня бачыць;
і [мае] вушы, каб чуць, а ня чуе, бо гэта дом бунтаўнікоў.
3 І ты, сыне чалавечы, зрабі сабе рэчы для выгнаньня, і ўдзень на вачах іхніх выйдзі з месца
твайго, і ідзі ў іншае [месца] на вачах іхніх. Можа, яны ўбачаць, хоць яны — дом бунтаўнікоў.
4 І вынясеш рэчы твае, як рэчы выгнанца, удзень на вачах іхніх, і выйдзеш увечары на вачах
іхніх так, як выходзяць выгнанцы.

5 На вачах іхніх зрабі дзіру ў муры і выйдзі праз яе.
6 На вачах іхніх ускладзі [рэчы] на плечы твае і выйдзі ў прыцемках, і закрый аблічча тваё, каб
ня бачыў ты зямлі, бо Я стаўлю цябе як знак для дому Ізраіля».
7 І я зрабіў так, як мне было загадана. Рэчы мае я вынес удзень як рэчы выгнанца. А ўвечары
зрабіў сабе рукамі дзіру ў муры, выйшаў у прыцемках і на вачах іхніх усклаў [рэчы] на плечы.
8 І было слова ГОСПАДА да мяне раніцаю, кажучы:
9 «Сын чалавечы, ці дом Ізраіля, дом бунтаўнікоў, не казаў табе: “Што ты робіш?”
10 Скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Цяжар адносна ўладара, які ў Ерусаліме, і ўсяго дому
Ізраіля, які пасярод яго”
11 Скажы: “Я — знак для вас. Як я зрабіў, так і з вамі станецца. Пойдзеце на выгнаньне ў
няволю!
12 Уладар, які сярод вас, ускладзе ў прыцемках на плечы [рэчы] і выйдзе праз мур. Зробяць
дзіру, каб выйсьці праз яе, і ён закрые аблічча сваё, каб вачыма ня бачыць зямлі.
13 І Я пастаўлю сетку Маю на яго, і ён будзе схоплены ў пастку Маю, і Я завяду яго ў Бабілон, у
зямлю Халдэйцаў, але ён яе ня ўбачыць і там памрэ.
14 І ўсіх, якія вакол яго, памочнікаў ягоных і войска ягонае, Я разганю на ўсе вятры, і выцягну
на іх меч”.
15 І яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі расьцярушу іх сярод народаў і раскідаю іх у
[розныя] землі.
16 А некаторых з іх Я захаваю ад мяча, голаду і заразы, каб расказвалі пра ўсе брыдоты свае
сярод народаў, куды прыйдуць, і яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД».
17 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
18 «Сыне чалавечы, хлеб твой будзеш есьці з трывогаю і ваду тваю будзеш піць з непакоем і
страхам,
19 і скажаш народу зямлі гэтай: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД да жыхароў Ерусаліму ў зямлі
Ізраіля. Хлеб свой яны будуць есьці ў страху, і ваду сваю будуць піць у трывозе, бо зямля
іхняя станецца пустэчай і будзе пазбаўленая дастатку свайго з прычыны гвалту, [які чыняць]
усе, што жывуць на ёй.
20 Населеныя гарады будуць спустошаныя, і зямля станецца пустэчаю. І вы даведаецеся, што
Я — ГОСПАД”».
21 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
22 «Сыне чалавечы, што за прыказку вы маеце пра зямлю Ізраіля, кажучы: “Дні мінаюць, і ўсе
відзежы не спаўняюцца”.
23 Дзеля гэтага скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Я зраблю, што ня будзе прыказкі гэтай
і ня будуць больш паўтараць яе ў Ізраілі”. Бо гэта прамоў да іх: “Надыходзяць дні, і слова
кожнага відзежу [зьдзейсьніцца].
24 Ня будзе ўжо больш сярод дому Ізраіля ніводнага пустога відзежу і падманнага прароцтва.
25 Бо, Я, ГОСПАД, буду прамаўляць, і слова, якое Я прамоўлю, споўніцца, і ня будзе больш
затрымлівацца. Бо ўжо ў дні вашыя, дом бунтаўнікоў, Я прамоўлю слова і споўню яго, кажа
Госпад ГОСПАД”».
26 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
27 «Сыне чалавечы, вось, дом Ізраіля кажа: “Відзежы, якія ён мае, [датычаць] дзён вельмі
далёкіх. Ён прарочыць пра далёкую будучыню”.
28 Дзеля гэтага скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ужо ня будзе затрымлівацца кожнае
слова Маё. Слова, якое Я прамоўлю, споўніцца, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 13

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, прароч пра прарокаў Ізраіля, якія прарочаць, і кажы прарокам, якія
[прарочаць] з сэрца свайго: “Слухайце слова ГОСПАДА.

3 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Гора дурным прарокам, якія ходзяць паводле духа свайго, а нічога
ня бачылі.
4 Як лісы сярод руінаў прарокі твае, Ізраіль!
5 Не ўзыходзілі вы ў выломы і не будавалі муроў вакол дому Ізраіля, каб ён стаяў у бітве ў
дзень ГОСПАДА".
6 Яны бачаць марнасьць і прарочаць фальшыва, кажучы: "Кажа ГОСПАД", а ГОСПАД не пасылаў
іх, і яны чакаюць, што споўніцца слова [іхняе].
7 Ці ня мелі вы відзежаў марных і ці не казалі вы прароцтваў фальшывых, і казалі: "Кажа
ГОСПАД", а Я не прамаўляў гэтага.
8 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "За тое, што вы прамаўлялі марноту і бачылі падман,
вось, Я супраць вас, кажа Госпад ГОСПАД.
9 І будзе рука Мая супраць прарокаў, якія бачаць марнасьць і прадказваюць падман. Ня будуць
яны належаць да народу Майго і ня будуць упісаныя ў сьпіс дому Ізраіля, і ня ўвойдуць у зямлю
Ізраіля, і даведаецеся, што Я — Госпад ГОСПАД".
10 За тое вось, што яны ўводзілі ў зман народ Мой, кажучы: "Мір", а міру няма, і калі будаваўся
мур, яны тынкавалі яго,
11 скажы тым, якія тынкуюць [мур]: "[Тынк] адваліцца. Пойдзе дождж залеўны, і будзе падаць
град, і падымецца гвалтоўны вецер,
12 і вось, мур абрынецца. І ці вам ня скажуць: "Дзе той тынк, якім вы тынкавалі?""
13 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "Я прывяду вецер гвалтоўны ў лютасьці Маёй, і
пойдзе дождж улеўны ў гневе Маім і град — у абурэньні Маім, каб зьнішчыць [усё].
14 І Я развалю той мур, які вы атынкавалі, і павалю яго на зямлю, так што будзе відзён падмурак
ягоны, і ён абрынецца, а вы пад ім загінеце. І даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
15 Я выльлю лютасьць Маю на мур і на тых, якія яго тынкуюць, і скажу вам: "Дзе мур і дзе тыя,
якія яго тынкуюць?
16 [Дзе] прарокі Ізраіля, якія прарочаць пра Ерусалім, і бачаць пра яго відзежы міру? І дзе мір?"
— кажа Госпад ГОСПАД".
17 А ты, сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на дочак народу твайго, якія прарочаць з сэрца
свайго, і прароч супраць іх.
18 І скажы: "Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Гора тым, якія шыюць стужкі на ўсе локці рук сваіх і
робяць хусткі ўсякага кшталту на галовы, каб лавіць душы. Вы ловіце душы народу Майго, а
душы свае [хочаце] захаваць пры жыцьці?
19 Вы зьнеслаўляеце Мяне перад народам Маім за жменю ячменю і кавалак хлеба, забіваючы
душы, якія не павінны памерці, і ашчаджаючы душы, якія ня маюць жыць, калі падманваеце
народ Мой, які слухае падман.
20 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць стужак вашых, якімі вы ловіце душы,
як птушак, і Я пазрываю іх з рамёнаў вашых, і выпушчу душы, якія вы злавілі, як птушак.
21 І Я пазрываю хусткі вашыя і вызвалю народ Мой з рук вашых, і больш ня будзе ён здабычай
у руках вашых, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
22 За тое, што вы хлусьнёю засмучалі сэрца праведніка, хоць Я не засмучаў яго, і ўмацоўвалі
рукі бязбожніка, каб ён не навярнуўся ад шляху ліхога свайго і жыў,
23 ня будзеце мець відзежаў марных і ня будзеце больш прадказваць прадказаньні, і Я вызвалю
народ Мой з рук вашых, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД"».

Эзк 14

1 І прыйшлі да мяне некаторыя са старшыняў Ізраіля, і селі перад абліччам маім.
2 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
3 «Сыне чалавечы, гэтыя людзі ўвялі ў сэрцы свае ідалаў сваіх і паставілі перад абліччам сваім
тое, што было прычынаю грэху іхняга. Ці ж пытаючыся, будуць пытацца ў Мяне [парады]?
4 Дзеля гэтага прамовіш да іх і скажаш ім: "Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Кожны чалавек з дому
Ізраіля, які ўвёў ідалаў сваіх у сэрца сваё і паставіў перад аблічча сваё тое, што было прычынаю
грэху ягонага, і прыйдзе да прарока, Я, ГОСПАД, адкажу яму адпаведна да ліку ідалаў ягоных,

5 каб выявіць [намеры] сэрца дому Ізраіля, які адвярнуўся ад Мяне з прычыны ўсіх ідалаў сваіх”.
6 Дзеля гэтага скажы дому Ізраіля: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Навярніцеся і адвярніцеся ад ідалаў вашых, і ад усіх брыдотаў вашых адвярніце абліччы вашыя.
7 Бо кожнаму чалавеку з дому Ізраіля і прыхадню, які пасяліўся ў Ізраілі, якія адвярнуліся ад Мяне, і ўвялі ў сэрца сваё ідалаў сваіх, і паставілі перад абліччам сваім тое, што было прычынаю грэху іхняга, і прыйшлі да прарока, каб праз яго спытацца ў Мяне [парады], Я, ГОСПАД, адкажу яму.
8 І Я зьвярну аблічча Маё супраць чалавека таго, і зраблю яго знакам і прыказкай, і вынішчу яго з народу Майго, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
9 А калі б прарок дазволіў сабе ашукацца і прамовіў слова, Я, ГОСПАД, вазьму прарока таго, і выцягну руку Маю супраць яго, і зьнішчу яго спаміж народу Майго, Ізраіля.
10 І яны панясуць беззаконьні свае! Беззаконьне прарока будзе такім, як і таго, які ў яго пытаўся,
11 каб дом Ізраіля не адыходзіўся больш ад Мяне і не паганіўся больш ніякімі бунтамі сваімі. І будуць яны для Мяне народам, а Я буду для іх Богам, кажа Госпад ГОСПАД”».
12 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
13 «Сыне чалавечы, калі якая зямля саграшыць супраць Мяне нявернасьцю, Я выцягну руку Маю супраць яе і зламлю падпору хлеба, і спашлю на яе голад, і вынішчу на ёй чалавека і быдла.
14 І калі будуць тры чалавекі [праведныя] пасярод яе: Ной, Даніил і Ёў, яны дзеля праведнасьці сваёй захаваюць [толькі] жыцьцё сваё, кажа Госпад ГОСПАД.
15 Калі Я прывяду дзікіх зьвяроў на зямлю гэтую і зраблю яе бясплоднай, і станецца яна пусткаю, каб ніхто акрамя дзікіх зьвяроў не праходзіў там,
16 і калі пасярод яе будуць тры чалавекі гэтыя, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, не захаваюць яны ані сыноў, ані дачок, яны захаваюць [толькі] саміх сябе, а зямля станецца пусткаю.
17 Або калі Я прывяду меч на зямлю гэтую і скажу: “Няхай меч пройдзе праз зямлю гэтую, і зьнішчыць на ёй чалавека і быдла”,
18 і калі будуць пасярод яе тры чалавекі гэтыя, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, не захаваюць яны ані сыноў, ані дачок, але захаваюць [толькі] саміх сябе.
19 Або калі Я спашлю заразу на зямлю гэтую і ў крыві выльлю гнеў Мой на яе, каб зьнішчыць на ёй чалавека і быдла,
20 і калі Ной, Даніил і Ёў будуць пасярод яе, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, не захаваюць яны ані сыноў, ані дачок, але дзеля праведнасьці сваёй яны захаваюць [толькі] душу сваю.
21 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Нават калі Я прывяду на Ерусалім гэтыя чатыры зьнішчальныя плягі Мае: меч, голад, дзікіх зьвяроў і заразу, каб зьнішчыць у ім чалавека і быдла,
22 вось, яшчэ застануцца захаваныя сыны і дочкі, якіх выведуць з яго. Вось, яны прыйдуць да вас, і вы ўбачыце шляхі іхнія і ўчынкі іхнія, і будзеце мець пацяшэньне пасьля ліха, якое Я прывёў на Ерусалім, пасьля ўсяго, што Я прывёў на яго.
23 І яны пацешаць вас, калі ўбачыце шляхі іхнія і ўчынкі іхнія, і даведаецеся, што не без падставаў было ўсё гэта, што Я яму зрабіў, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 15

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, ці дрэва вінаграду лепшае за ўсе дрэвы лісьцёвыя, якія сярод дрэваў у лесе?
3 Ці бяруць з яго дрэва, каб нешта зрабіць? Ці бяруць з яго калок, каб на ім павесіць нейкія рэчы?
4 Вось, кідаецца яно ў агонь на спаленьне, абодва ягоныя канцы спальвае агонь, і сярэдзіна ягоная згарыць. Ці надаецца яно на нешта?

5 Вось, калі яно цэлае не надавалася да апрацоўкі, тым больш яно не надаецца да апрацоўкі,
калі агонь яго спаліў, і яно згарэла.
6 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД. Як з дрэвам вінаграду сярод, дрэваў у лесе, якое Я
ўкінуў у агонь на спаленьне, так зраблю з жыхарамі Ерусаліму.
7 І Я зьвярну аблічча Маё супраць іх. З [аднаго] агню яны выйшлі, але [другі] агонь іх праглыне.
І даведаецеся, што Я — ГОСПАД, калі Я зьвярну аблічча Маё супраць іх.
8 І Я замяню зямлю гэтую ў пустку, бо яны нявернасьцю няверныя, кажа Госпад ГОСПАД».

Эзк 16

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, паведамі Ерусаліму пра брыдоты ягоныя,
3 і скажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД да Ерусаліму: “Паходжаньне тваё і нараджэньне тваё —
з зямлі Ханаан. Бацька твой — Амарэец, а маці твая — Хетка.
4 Калі ты нарадзілася, у дзень нараджэньня твайго не абрэзалі табе пупавіны, не абмылі цябе
ў вадзе, каб ачысьціць [цябе]; не нацерлі цябе сольлю і не спавілі цябе ў пялюшкі.
5 Не паспагадала табе нічыё вока, каб зрабіць для цябе адну з [паслугаў] гэтых з літасьці да
цябе. І выкінулі цябе на аблічча поля з абыякавасьцю да душы тваёй у дзень нараджэньня
твайго.
6 І Я праходзіў каля цябе, і ўбачыў цябе, як ты трапяталася ў крыві тваёй, і Я сказаў табе, калі
[ты была] ў крыві тваёй: “Жыві!” І Я сказаў табе, калі [ты была] ў крыві тваёй: “Жыві!”
7 І Я вырасціў цябе, як краску палявую, і ты расла, і вырасла, і сталася дарослай, і грудзі твае
набылі форму, і валасы твае сталіся густымі, але была ты голая і неакрытая.
8 І Я праходзіў каля цябе, і ўбачыў цябе. І вось, [гэта быў] твой час, час каханьня. І Я расьцягнуў
плашч Мой над табою, і закрыў голасьць тваю, і прысягнуў табе, і заключыў з табою запавет,
кажа Госпад ГОСПАД, і ты сталася Маёю.
9 І Я абмыў цябе вадою, і абцёр з цябе кроў тваю, і памазаў цябе алеем,
10 і апрануў цябе ў шату вышываную, азуў цябе ў [чаравікі са скуры] тахаш, апаясаў цябе
вісонам і акрыў цябе ядвабам.
11 І Я ўпрыгожыў цябе пэрлінамі, і ўсклаў бранзалеты на рукі твае, і нашыйнік на шыю тваю,
12 і даў кольчык над вусны твае і завушніцы ў вушы твае, і вянок аздобны на галаву тваю.
13 І ты была апранутая ў золата і срэбра, у вісон, і ядваб, і шаты вышываныя, ела ты муку, мёд
і алей, і ставалася вельмі і вельмі прыгожай, і дасягнула годнасьці валадарскай.
14 І распаўсюдзілася імя тваё сярод народаў дзеля прыгажосьці тваёй, бо была ты дасканалай
дзеля ўпрыгожваньняў Маіх, якімі Я ўпрыгожыў цябе, кажа Госпад ГОСПАД.
15 І паспадзявалася ты на прыгажосьць тваю, і чужаложыла дзеля [славы] імя твайго, і чыніла
распусту з кожным, хто праходзіў, хто надарыўся.
16 І брала ты шаты твае, і рабіла сабе ўзгоркі ў разнастайных колерах, і чужаложыла на іх.
17 І брала ты ўпрыгожваньні твае з золата Майго і са срэбра Майго, якія Я даў табе, і рабіла з іх
выявы мужчынаў, і чужаложыла з імі.
18 І брала ты шаты вышываныя твае, і апранала іх, і алей Мой і кадзіла Маё прыносіла перад
аблічча іхняе.
19 І хлеб Мой, які Я даў табе, муку, і алей, і мёд, якімі Я карміў цябе, ты прыносіла перад аблічча
іхняе на мілы пах, і было гэтак, кажа Госпад ГОСПАД.
20 І брала ты сыноў тваіх і дочак тваіх, якіх ты нарадзіла Мне, і складала іх у ахвяру на
зьнішчэньне. Ці ж ня досыць распусты тваёй?
21 І ты забівала сыноў Маіх і складала іх у ахвяру, праводзячы праз агонь.
22 І [робячы] ўсе брыдоты твае і распусту тваю, ты ня памятала пра дні маладосьці тваёй, калі
была ты голай і неакрытай і трапяталася ў крыві тваёй.
23 І сталася пасьля ўсіх злачынстваў тваіх: "Гора, гора табе!" — кажа Госпад ГОСПАД.
24 І ты будавала сабе ўзвышшы, і рабіла сабе ўзгоркі на кожнай плошчы.

25 На кожным скрыжаваньні дарог будавала сабе ўзгоркі, каб там паганіць прыгажосьць тваю,
і раскідала ногі твае для кожнага, хто праходзіў [там], і памнажала чужалоствы твае.
26 Ты чужаложыла з сынамі Эгіпту, суседзямі тваімі, вялікімі целам [сваім], і павялічвала
чужалоствы твае, каб гнявіць Мяне.
27 І вось, Я выцягнуў руку Маю супраць цябе, зьменшыў вызначанае табе, і аддаў цябе душы
тых, якія ненавідзяць цябе, дочкам Філістынскім, якія самі саромеліся шляху распусты тваёй.
28 І ты распусьнічала з сынамі Асірыі, бо ня мела насычэньня, распусьнічала з імі, але не
насыцілася.
29 І ты памножыла распусту тваю з купецкім краем Халдэйцаў, але таксама не насыцілася.
30 Як змучылася сэрца тваё, кажа Госпад ГОСПАД, калі ты рабіла ўсё тое, што робіць
бессаромная жанчына распусьніца?
31 Ты будавала ўзвышшы на скрыжаваньні кожнай дарогі, рабіла сабе ўзгоркі на кожнай
плошчы, і не была як блудніца, каб браць плату [за распусту],
32 але як жанчына, якая чужаложыць, якая замест мужа свайго прыймае [мужоў] чужых.
33 Усім блудніцам даецца плата, а ты давала плату тваю ўсім палюбоўнікам тваім і давала
падарункі ім, каб яны прыходзілі да цябе адусюль, каб распусьнічаць з табою.
34 І было ў цябе адваротна, чым у блудніцаў; ніхто ня гнаўся за табою, гэта ты давала плату, а
табе ніхто не даваў платы, і было ў цябе наадварот.
35 Дзеля гэтага, распусьніца, слухай слова ГОСПАДА!
36 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што ты выяўляла юрлівасьць тваю, і адкрывала голасьць
тваю, і распусьнічала з усімі палюбоўнікамі тваімі, з усімі брыдотнымі ідаламі тваімі, і за кроў
сыноў тваіх, якіх ты складала ў ахвяру для іх,
37 вось, Я зьбяру ўсіх палюбоўнікаў тваіх, якім ты спагадала, і ўсіх тых, якіх кахала, і ўсіх тых,
якіх ненавідзела, і зьбяру іх з усіх бакоў супраць цябе, і адкрыю голасьць тваю перад імі, і яны
ўбачаць усю голасьць тваю.
38 І Я буду судзіць цябе, як судзяць чужаложніц і тых, якія разьліваюць кроў, і аддам цябе на
[сьмерць] крывавую, гнеў і ярасьць.
39 І аддам цябе ў рукі іхнія, і яны зруйнуюць узвышшы твае, і зьнішчаць узгоркі твае, і здымуць
з цябе шаты твае, і забяруць аздобныя рэчы твае, і пакінуць цябе голаю і неакрытаю.
40 І склічуць супраць цябе супольны сход, і закідаюць цябе камянямі, і пасякуць цябе мячамі
сваімі,
41 і спаляць агнём дамы твае, і ўчыняць над табою суд на вачах шматлікіх жанчынаў. І Я спыню
распусту [тваю], і ўжо больш ты ня будзеш даваць платы [за распусту].
42 І Я заспакою гнеў Мой на табе, і адыйдзе лютасьць Мая ад цябе, і Я супакоюся, і больш ня
буду гневацца.
43 За тое, што ты ня памятала пра дні маладосьці тваёй і ўсімі ўчынкамі гнявіла Мяне, Я
таксама, глядзі, ускладу шляхі твае на галаву тваю, кажа Госпад ГОСПАД, і больш не дадасі
распусты да ўсіх брыдотаў тваіх.
44 Вось, кожны, хто будзе кпіць з цябе, скажа пра цябе прыказку: “Якая маці, такая і дачка”.
45 Ты — дачка маці тваёй, якая здрадзіла мужу свайму і сынам сваім, і ты — сястра сёстраў
тваіх, якія здрадзілі мужам сваім і сынам сваім. Маці вашая — Хетка, а бацька ваш — Амарэец.
46 Твая сястра старэйшая — Самарыя, яна і дочкі ейныя жывуць налева ад цябе, а твая
малодшая сястра, якая разам з дочкамі сваімі жыла направа ад цябе, — Садом.
47 Толькі кароткі час не хадзіла ты шляхамі іхнімі і не чыніла брыдотаў іхніх, а пасьля рабіла
горш за іх на ўсіх шляхах тваіх.
48 Як Я жывы, кажа Госпад ГОСПАД, сястра твая, Садом, разам з дочкамі ейнымі не рабіла так,
як рабіла ты і дочкі твае.
49 Вось такое было беззаконьне Садома, сястры тваёй: пыха, багацьце хлеба і гультайства было
ў яе і дочак ейных, і яны не ўмацоўвалі рукі беднага і нешчасьлівага,
50 і вывышаліся, і рабілі брыдоты перад абліччам Маім. І Я зьнішчыў іх, калі ўбачыў гэта.

51 І Самарыя не дасягнула паловы грахоў тваіх, і ты памножыла брыдоты твае больш, чым яны,
і ты апраўдала сёстраў тваіх усімі брыдотамі тваімі, якія ты ўчыніла.
52 Дык ты таксама насі ганьбу тваю, ты, якая апраўдала сёстраў сваіх грахамі тваімі, якіх ты
ўчыніла больш, чым яны. Яны больш праведныя, чым ты. Дык засаромся і насі ганьбу тваю,
бо ты апраўдала сёстраў сваіх.
53 І Я адмяню долю іхнюю, долю Садому і дочак ейных, і долю Самарыі і дочак ейных, і долю
тваю сярод іх,
54 каб ты насіла ганьбу тваю і была асаромленая за ўсё тое, што ўчыніла, і пацешыла іх гэтым.
55 Твая сястра Садом і дочкі ейныя вернуцца да першага стану свайго. І Самарыя і дочкі ейныя
вернуцца да першага стану свайго. І ты, і дочкі твае вернецеся да першага стану свайго.
56 Ці ж у дні пыхі тваёй не было гаворкі ў вуснах тваіх пра сястру тваю Садом,
57 перш чым распуста твая не была адкрытая? Падобна як яна, так і ты цяпер стала
пасьмешышчам для дочак Араму і ўсіх ваколіцаў іхніх і для дочак Філістынскіх, якія
пагарджаюць табою.
58 Чужалоства тваё і брыдоты твае ты панясеш, кажа ГОСПАД.
59 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Я зраблю з табою так, як зрабіла ты, якая пагардзіла прысягай
і парвала запавет.
60 Але Я ўзгадаю запавет Мой, які Я заключыў з табою ў дні маладосьці тваёй, і Я заключу з
табою запавет вечны.
61 І ты ўзгадаеш шляхі твае, і засаромеешся, калі прыймеш да сябе сёстраў тваіх, як старэйшых,
так і малодшых ад цябе, і Я дам іх табе за дочак, але не з прычыны запавету з табой.
62 І Я заключу запавет Мой з табою, і ты даведаешся, што Я — ГОСПАД,
63 каб ты памятала і саромелася, і каб ад сораму не адкрывала вуснаў тваіх перад абліччам
Маім, калі Я прабачу табе ўсё, што ты зрабіла, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 17

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, загадай загадку і раскажы прыповесьць дому Ізраіля.
3 І скажаш: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вялікі арол з вялікімі крыламі, з доўгімі пёрамі, з
рознакаляровым пер’ем, прыляцеў на Лібан і сарваў вершаліну кедра.
4 Адарваў найвышэйшы парастак ягоны і занёс яго ў зямлю Ханаан, і зьмясьціў яго ў горадзе
гандлёвым.
5 І ўзяў насеньне з зямлі той, і пасадзіў яго на полі ўрадлівым, над шматлікімі водамі як вярбу
пасадзіў яго.
6 І ён рос, і разрастаўся ў буйную лазу вінаградную нізкага росту, каб галіны ягоныя нахіліліся
да яго, і карані ягоныя былі пад ім. І стаўся лазою вінаграднаю, і выпусьціў галінкі, і акрыўся
лістотай.
7 І быў другі арол вялікі, з вялікімі крыламі і доўгімі пёрамі, і вось, вінаград той зьвярнуў
карані свае да яго і галіны свае пусьціў да яго, каб ён напойваў яго, а ня тая града, на якой быў
пасаджаны.
8 На полі добрым, над водамі шматлікімі быў ён пасаджаны, каб пускаў галіны і прыносіў
плады і каб стаўся вінаградам выборным”.
9 Скажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ці пашчасьціць яму? Ці ня вырвуць карані ягоныя і ці не
пазрываюць плады ягоныя? І зьвянуць усе сьвежыя парасткі ягоныя, і ён ссохне, і ня [будзе
трэба] ані рамяна моцнага, ані народу шматлікага, каб вырваць яго з каранямі.
10 І вось, ён быў пасаджаны. Ці пашчасьціць яму? Ці ня ссохне ён, калі дакранецца да яго
ўсходні вецер? Ён ссохне на градзе, на якой выпускаў парасткі свае”».
11 І было да мяне слова ГОСПАДА, кажучы:
12 «Скажы, прашу, дому бунтаўнікоў: “Ці вы ня ведаеце, што гэта [значыць]?” Скажы: “Вось,
прыйшоў валадар Бабілонскі ў Ерусалім, схапіў валадара ягонага і князёў ягоных, і завёў іх да
сябе, у Бабілон.

13 І ўзяў [аднаго] з насеньня валадара, і заключыў з ім запавет, і прысягаю зьвязаў яго, а
магнатаў зямлі забраў,
14 каб было валадарства пакорным, не паўставала, але захоўвала запавет ягоны, каб быць
верным яму.
15 Але [валадар] збунтаваўся і паслаў пасланцоў сваіх у Эгіпет, каб даў яму коней і шмат
людзей. Ці пашчасьціць яму? Ці выратуецца той, хто робіць гэтак? Ці той, хто парушыў
запавет, будзе ўратаваны?
16 Як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, у месцы валадара, які паставіў яго валадаром, таго, які
зламаў прысягу і парушыў запавет ягоны, у Бабілоне заб'е.
17 Не дапаможа яму фараон войскам вялікім і супольнасьцю шматлікай у баі, калі насыплюць
вал і пабудуюць махіны [для аблогі], каб загубіць мноства душаў.
18 Ён зламаў прысягу і парушыў запавет, хоць і прыкладаў руку сваю, ён усё гэта зрабіў, таму
не ўцячэ".
19 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "Як жыву Я, прысягу Маю, якую ён адкінуў, і запавет
Мой, які ён парушыў, Я ўскладу на галаву ягоную.
20 І закіну на яго сетку Маю, і ён будзе злоўлены ў пастку Маю, і прывяду яго ў Бабілон, і яго
там за нявернасьць адносна Мяне.
21 А ўсе выбранцы ягоныя з усяго войска ягонага загінуць ад мяча, а тыя, што застануцца,
будуць раскінутыя на ўсе вятры. І даведаецеся, што Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта]".
22 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Я вазьму вершаліну кедра вялікага і пасаджу, з найвышэйшых
парасткаў яго выламлю галінку і пасаджу яе на высокай і стромай гары.
23 На гары высокай Ізраіля пасаджу яе, і яна пусьціць галіны, і дасьць плод, і станецца кедрам
высокім. І абжывуцца на ім усялякія птушкі, і ўсё крылатае абжывецца ў ценю галінаў ягоных.
24 І даведаюцца ўсе дрэвы палявыя, што Я — ГОСПАД, Які панізіў дрэва высокае і ўзвысіў дрэва
нізкае, Які высушыў дрэва зялёнае і зазеляніў дрэва ссохлае. Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта] і
зрабіў"».

Эзк 18

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Чаму вы паўтараеце гэтую прыказку ў зямлі Ізраіля, кажучы: "Бацькі елі горкія ягады, а
зубы ў сыноў здрантвелі"?
3 Як жыву Я, кажа Госпад ГОСПАД, ня будзеце больш паўтараць гэтай прыказкі ў Ізраілі.
4 Вось, усе душы — Мае, як душа бацькі, так і душа сына — Мае; душа, якая саграшыла, памрэ.
5 А чалавек, калі ён праведны і чыніць суд і праведнасьць,
6 на гарах не банкетуе і вачэй сваіх не падымае да ідалаў дому Ізраіля, і не паганіць жонку
бліжняга свайго, і не набліжаецца да жонкі ў час нячыстасьці,
7 ня крыўдзіць нікога, вяртае даўжніку заклад ягоны, рабункам не рабуе, дае хлеб галоднаму
і голага апранае вопраткай,
8 не займаецца ліхвярствам, не вымагае адсоткаў, адварочвае ад ліхоты руку сваю, чыніць суд
справядлівы паміж чалавекам і чалавекам,
9 ходзіць паводле пастановаў Маіх і суд Мой захоўвае, робіць праўду, ён — праведнік, будзе
жыць і жыць, кажа Госпад ГОСПАД.
10 А калі ён нарадзіў сына гвалту, які разьлівае кроў, і ўчыніў брату адно з гэтых [злачынстваў],
11 а [бацька] ўсяго гэтага не рабіў, [сына], які на гарах банкетаваў і жонку бліжняга свайго
спаганіў,
12 крыўдзіў беднага і ўбогага, рабункам рабаваў, не аддаваў закладзенага, падымаў вочы свае
да ідалаў, рабіў брыдоты,
13 займаўся ліхвярствам, вымагаў адсоткаў, такі жыў, і ня будзе жыць, бо рабіў усе брыдоты
гэтыя. Ён сьмерцю памрэ, а кроў ягоная на ім будзе.
14 А калі нехта нарадзіў сына, і той убачыў усе грахі бацькі свайго, якія ён чыніў, і ўбачыў, і не
рабіў так, як ён,

15 на гарах не банкетаваў, вачэй сваіх не падымаў на ідалаў дому Ізраіля, жонкі бліжняга
свайго не паганіў,
16 нікога ня крыўдзіў, закладзенага не затрымоўваў, рабункам не рабаваў, даваў хлеб свой
галоднаму, голага апранаў вопраткай,
17 адварочваў руку сваю ад крыўды, не займаўся ліхвярствам і адсоткаў ня браў, суд Мой чыніў
і паводле пастановаў Маіх хадзіў, такі не памрэ за беззаконьні бацькі свайго, але будзе жыць і
жыць.
18 Бацька ягоны за тое, што крыўдаю крыўдзіў, рабункам рабаваў брата і рабіў у народзе сваім
тое, што ня ёсьць добрым, памрэ за беззаконьне сваё.
19 Вы кажаце: “Чаму сын не нясе беззаконьні бацькі свайго?” Але сын чыніў суд і
праведнасьць, захоўваў усе пастановы Мае і выконваў іх, і будзе жыць і жыць.
20 Душа, якая грашыць, памрэ. Сын не панясе беззаконьні бацькі, і бацька не панясе
беззаконьні сына. Праведнасьць праведніка будзе яму залічана, і бязбожнасьць бязбожніка
будзе на ім.
21 І бязбожнік, калі адвернецца ад усіх грахоў сваіх, якія ўчыніў, і будзе захоўваць усе
пастановы Мае і чыніць суд і праведнасьць, будзе жыць і жыць, і не памрэ.
22 Усе злачынствы ягоныя, якія ўчыніў, ня будуць яму залічаны, і ў праведнасьці сваёй, якую
робіць, будзе жыць.
23 Ці ж Я жаданьнем жадаю сьмерці бязбожніка, кажа Госпад ГОСПАД, ці каб адвярнуўся ад
шляху свайго і жыў?
24 Калі праведнік адвернецца ад праведнасьці сваёй і ўчыніць злачынства, падобнае да ўсіх
брыдотаў, якія робіць бязбожнік, ці ж будзе ён жыць? Уся праведнасьць ягоная, якую чыніў,
ня будзе залічаная яму. У нявернасьці сваёй, якой быў няверным [Мне], і ў грэху сваім, якім
саграшыў, памрэ.
25 Вы кажаце: “Несправядлівы шлях Госпада”. Паслухайце, прашу, дом Ізраіля! Ці шлях Мой
несправядлівы, ці шляхі вашыя несправядлівыя?
26 Калі праведнік адвернецца ад праведнасьці сваёй, і будзе рабіць злачынства, і памрэ ў іх, ён
памрэ з прычыны злачынства свайго, якое ўчыніў.
27 А калі бязбожнік адвернецца ад бязбожнасьці сваёй, якую чыніў, і будзе чыніць суд і
праведнасьць, ён захавае пры жыцьці душу сваю.
28 Ён убачыў і, адварочваючыся, адвярнуўся ад усіх злачынстваў сваіх, якія ўчыніў, і будзе
жыць і жыць, і не памрэ.
29 Але дом Ізраіля кажа: “Несправядлівы шлях Госпада” Ці шляхі Мае несправядлівыя, доме
Ізраіля, ці шляхі вашыя несправядлівыя?
30 Дзеля гэтага, дом Ізраіля, Я буду судзіць вас кожнага паводле шляхоў вашых, кажа Госпад
ГОСПАД. Навярніцеся і адвярніцеся ад усіх злачынстваў вашых, і ня будзе вам нагоды для
беззаконьня.
31 Адкіньце ад сябе ўсе злачынствы свае, праз якія вы бунтаваліся [супраць Мяне], і ўчыніце
сабе сэрца новае і дух новы. Навошта вы маеце паміраць, дом Ізраіля?
32 Бо Я не хачу сьмерці таго, хто мае памерці, кажа Госпад ГОСПАД. Навярніцеся і жывіце!

Эзк 19

1 А ты ўзьнімі лямант над князямі Ізраіля,
2 і скажаш: “Якой ільвіцай сярод ільвоў была маці твая? Яна ляжала паміж ільвянятамі,
гадавала малых сваіх.
3 І выгадавала яна адно з ільвянятак сваіх, і стаўся ён маладым ільвом, навучыўся хапаць
здабычу і жэрці чалавека.
4 І склікалі супраць яго народы, і патрапіў ён у яму іхнюю, і павялі яго на ланцугу ў зямлю
Эгіпецкую.
5 І ўбачыла яна, што [дарма] чакае і што загінула надзея ейная, узяла іншага з ільвянятак сваіх,
і выгадавала яго ільвом.

6 І бегаў ён паміж ільвамі, і стаўся ён маладым ільвом, і навучыўся хапаць здабычу і жэрці
чалавека.
7 І спазнаў ён палацы іхнія, і пустошыў гарады іхнія, і слупянела зямля і ўсё, што на ёй, ад
голасу рыку ягонага.
8 І сабраліся супраць яго народы адусюль з навакольля, і расьцягнулі на яго сетку сваю, і
патрапіў ён у яму іхнюю.
9 На ланцугу запхнулі яго ў клетку і завялі яго да валадара Бабілонскага, і ён замкнуў яго ў
вязьніцы, каб ня чуўся больш голас ягоны па гарах Ізраіля.
10 Маці твая [была] як вінаград у вінаградніку, пасаджаны над вадою, і мела шмат пладоў, і
разраслася дзеля мноства вады.
11 І пусьціла яна моцныя галіны, прыдатныя на скіпетры валадароў, і вывышалася
прыгажосьцю сваёй сярод гушчару, і была заўважная прыгажосьцю сваёй сярод галінаў сваіх.
12 Але ў гневе была яна вырваная, кінутая на зямлю, і вецер усходні высушыў плады ейныя,
былі паламаныя і высахлі галіны ейныя, і агонь зьеў яе.
13 І цяпер яна перасаджаная ў пустыню, у зямлю сухую і спрагнёную.
14 І выйшаў агонь з галінаў ейных, і зьеў плады ейныя, і няма ўжо ў яе галінаў моцных, скіпетра
валадароў. Вось лямант, і будзе [над ёю] лямант”».

Эзк 20

1 І сталася ў сёмым годзе, у пятым [месяцы], у дзясяты [дзень] месяца, прыйшлі некаторыя са
старшыняў Ізраіля, каб парадзіцца ў ГОСПАДА, і селі перад абліччам маім.
2 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
3 «Сыне чалавечы, прамоў да старшыняў Ізраіля і скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вы
прыйшлі, каб шукаць Мяне? Як жывы Я, не адкажу вам, кажа Госпад ГОСПАД”.
4 Ці ж будзеш судзіць іх, ці будзеш судзіць, сыне чалавечы? Пакажы ім брыдоты бацькоў іхніх.
5 І скажаш ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. У той дзень, калі Я выбраў Ізраіля і падняў руку Маю,
[прысягаючы] насеньню дому Якуба, і аб’явіўся ім у зямлі Эгіпецкай, і падняў руку Маю да іх,
кажучы: “Я — ГОСПАД, Бог ваш”,
6 у той дзень Я падняў руку Маю да іх, каб вывесьці іх з зямлі Эгіпецкай у зямлю, якую выбраў
для іх, якая ацякае малаком і мёдам, пэрліну спасярод усіх земляў.
7 І Я сказаў ім: “Няхай кожны выкіне брыдоту з вачэй сваіх. Не паганьцеся ідаламі Эгіпецкімі.
Я — ГОСПАД, Бог ваш”.
8 Але яны збунтаваліся і не хацелі слухаць Мяне. Не адкінулі брыдоту з вачэй сваіх і не пакінулі
ідалаў Эгіпецкіх. І Я сказаў, што выльлю абурэньне Маё на іх і заспакою гнеў Мой на іх пасярод
зямлі Эгіпецкай.
9 Але зрабіў [іначай] дзеля імя Майго, каб не было яно зьняважана ў вачах народаў, сярод якіх
яны былі, на вачах якіх Я аб’явіўся ім, каб вывесьці іх з зямлі Эгіпецкай.
10 І Я вывеў іх з зямлі Эгіпецкай, і завёў іх у пустыню.
11 І даў ім пастановы Мае, і аб'явіў ім суд Мой, каб, спаўняючы іх, чалавек жыў дзякуючы ім.
12 І таксама даў ім суботы Мае, каб былі знакам паміж Мною і імі, каб ведалі, што Я— ГОСПАД,
Які асьвячае іх.
13 Але дом Ізраіля збунтаваўся супраць Мяне ў пустыні. Не хадзілі яны паводле пастановаў
Маіх і суд Мой адкінулі, спаўняючы які, чалавек жыць будзе дзякуючы яму, і суботы Мае вельмі
апаганілі. І Я сказаў, што выльлю абурэньне Маё на іх у пустыні, каб зьнішчыць іх.
14 Але зрабіў [іначай] дзеля імя Майго, каб не было яно зьняважана ў вачах народаў, бо Я вывеў
іх на вачах іхніх.
15 І Я таксама падняў руку Маю супраць іх у пустыні, што не ўвяду іх у зямлю, якую даў ім,
якая ацякае малаком і мёдам, пэрліну спасярод усіх земляў,
16 бо яны адкінулі суд Мой і не спаўнялі пастановаў Маіх, і суботы Мае паганілі, бо ішлі за
ідаламі сэрца іхняга.
17 Але зьлітавалася вока Маё над імі, каб ня вынішчыць іх, і Я ня выгубіў іх у пустыні.

18 І Я сказаў сынам іхнім у пустыні: “Не хадзіце паводле прыкладу бацькоў вашых і не
захоўвайце судоў іхніх, і не паганьцеся ідаламі іхнімі.
19 Я — ГОСПАД, Бог ваш. Хадзіце паводле пастановаў Маіх і суд Мой захоўвайце і спаўняйце
яго.
20 І сьвяціце суботы Мае, і няхай будуць яны знакам паміж Мной і вамі, каб вы ведалі, што Я —
ГОСПАД, Бог ваш”.
21 Але збунтаваліся тыя сыны; і не хадзілі паводле пастановаў Маіх, і не захоўвалі суд Мой, каб
спаўняць яго, каб, спаўняючы іх, жыў чалавек дзякуючы ім, і паганілі суботы Мае. І Я сказаў,
што выльлю абурэньне Маё на іх і заспакою гнеў Мой на іх у пустыні.
22 Але Я адвярнуў руку Маю і зрабіў [іначай] дзеля імя Майго, каб не зьняважыць яго ў вачах
народаў, бо Я вывеў іх на вачах іхніх.
23 І ізноў Я падняў руку Маю на іх у пустыні, каб расьцярушыць іх паміж народаў і раскідаць
іх паміж земляў
24 за тое, што яны не чынілі суд Мой і пагардзілі пастановамі Маімі, і суботы Мае паганілі, і на
ідалаў бацькоў іхніх падымалі вочы свае.
25 І Я даў ім мець пастановы, якія не былі добрыя, і суды, паводле якіх яны не маглі жыць.
26 Я даў ім паганіцца ахвярамі іхнімі, каб яны праводзілі праз агонь усё, што першароднае
ўлоньня, каб напалохаліся і каб даведаліся, што Я — ГОСПАД”.
27 Дзеля гэтага прамоў, сыне чалавечы, да дому Ізраіля і скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД.
Яшчэ гэтым зьневажалі Мяне бацькі вашыя, што нявернасьцю былі няверныя адносна Мяне.
28 І Я ўвёў іх у зямлю тую, якую, падняўшы руку Маю, [абяцаў] даць ім, і яны ўбачылі кожны
ўзгорак высокі і кожнае дрэва рассахатае, і складалі там свае ахвяры крывавыя і складалі там
свае дары агідныя, і складалі там свае ахвяры пахкія, і вылівалі там свае ахвяры вадкія.
29 І Я казаў ім: “Што ёсьць тое ўзвышша, што вы ўзыходзіце на яго?” І называюць яго ўзвышшам
па сёньняшні дзень”.
30 Дзеля гэтага скажы дому Ізраіля: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Дзеля шляху бацькоў вашых
вы паганіце сябе і чужаложыце з ідаламі іхнімі.
31 І калі складаеце дары вашыя, калі праводзіце сыноў вашых праз агонь, вы паганіцеся з усімі
ідаламі іхнімі аж па сёньняшні дзень. І Я маю даць вам, дом Ізраіля, шукаць [парады ў Мяне]?
Як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, ня дам вам шукаць [парады ў Мяне].
32 А тое, што прыходзіць вам на думку, ня станецца ніколі, бо вы кажаце: “Будзем, як народы,
як плямёны [іншых] земляў служыць дрэву і камяню”.
33 Як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, Я буду валадарыць над вамі рукою моцнай і рамяном
узьнятым, і з гневам страшным.
34 І Я выведу вас спаміж народаў, і зьбяру вас з земляў, у якія выгнаў вас, рукою моцнай і
рамяном узьнятым, і з гневам страшным.
35 І павяду вас у пустыню народаў гэтых, і буду вас судзіць там аблічча да аблічча.
36 Як Я судзіў бацькоў вашых у пустыні зямлі Эгіпецкай, так і вас судзіць буду, кажа Госпад
ГОСПАД.
37 І правяду вас пад дубцом, і завяду вас у путы запавету.
38 І аддзялю ад вас бунтаўнікоў і тых, якія грашаць супраць Мяне, і выведу іх з зямлі
пражываньня іхняга, але ў зямлю Ізраіля яны ня ўвойдуць, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
39 Дык вось, дом Ізраіля, гэта кажа Госпад ГОСПАД. Няхай кожны ідзе служыць ідалам сваім.
Але потым будзеце слухаць Мяне і ўжо больш ня будзеце паганіць імя Майго сьвятога ахвярамі
вашымі і ідаламі вашымі.
40 Бо на сьвятой гары Маёй, на высокай гары Ізраіля, кажа Госпад ГОСПАД, там будзе служыць
Мне ўвесь дом Ізраіля, усе, якія ў зямлі гэтай. Там Я ўпадабаю іх, і там буду шукаць ахвяраў
вашых і пяршынаў дароў вашых, і ўсяго, што вы пасьвяціце [Мне].
41 І Я ўпадабаю вас, як мілы пах, калі выведу вас спасярод народаў і зьбяру вас з тых земляў, у
якіх вы былі расьцярушаныя. І Я асьвячуся ў вас перад вачыма народаў гэтых,
42 і даведаецеся, што Я — ГОСПАД, калі прывяду вас у зямлю Ізраіля, у тую зямлю, адносна якой
Я падняў руку Маю бацькам вашым, што дам яе [вам].

43 І вы ўзгадаеце шляхі вашыя і ўсе ўчынкі вашыя, якімі вы спаганіліся, і самі будзеце
брыдзіцца сабою дзеля ўсіх тых злачынстваў, якія вы рабілі.
44 І даведаецеся, што Я — ГОСПАД, калі гэта зраблю Вам дзеля імя Майго, а не паводле вашых
шляхоў ліхіх і вашых учынкаў няверных, дом Ізраіля, кажа Госпад ГОСПАД”».
45 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
46 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на шлях на поўдзень і скіруй [слова] на поўдзень, і
прароч супраць лесу поля паўднёвага.
47 І скажы лесу паўднёваму: “Слухай слова ГОСПАДА. Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я
распалю ў табе агонь, і ён праглыне ў цябе кожнае дрэва зялёнае і кожнае дрэва сухое.
Палючае полымя ня згасне, і згарыць у ім усё ад поўдня аж на поўнач.
48 І ўбачыць кожнае цела, што Я — ГОСПАД, запаліў яго, і ён ня згасьне”».
49 І я сказаў: «О Госпадзе ГОСПАДЗЕ! Яны кажуць пра мяне: “Ён толькі прыповесьці
расказвае”».

Эзк 21

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на Ерусалім і скіруй [слова] супраць сьвятых месцаў, і
прароч супраць зямлі Ізраіля.
3 І скажы зямлі Ізраіля: “Гэта кажа ГОСПАД. Вось, Я супраць цябе, і Я выцягну меч Мой з похваў,
і ўдару пасярод цябе праведніка і бязбожніка.
4 Дзеля таго, што Я ўдару пасярод цябе праведніка і бязбожніка, выйдзе меч Мой з похваў
ягоных на ўсякае цела ад поўдня да поўначы.
5 І даведаецца ўсякае цела, што Я, ГОСПАД, выцягнуў меч Мой з похваў ягоных, і ён [да іх] ужо
ня вернецца”.
6 А ты, сыне чалавечы, стагні, нібыта маеш сьцёгны паламаныя, у горычы стагні на вачах іхніх.
7 І станецца, калі скажуць табе: “Чаму ты стогнеш?” — ты скажы: “Дзеля весткі, якая прыйдзе,
і самлее кожнае сэрца, і аслабеюць усе рукі, і згасьне ўсякі дух, і ўсе калені захістаюцца, як
вада”. Вось, яна прыходзіць, і станецца так, кажа Госпад ГОСПАД».
8 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
9 «Сыне чалавечы, прароч і кажы: “Гэта кажа Госпад. Гавары: “Меч, меч завостраны і
адшліфаваны;
10 завостраны, каб забіваць ахвяры, адшліфаваны, каб блішчэў”. Хіба будзем радавацца?
Скіпетр сына Майго пагарджае кожным дрэвам.
11 І дадзены ён, каб быў вычышчаны, каб узяць яго рукою, меч гэты завостраны і адшліфаваны,
каб быў ён у руцэ таго, які забівае.
12 Крычы і галасі, сыне чалавечы, бо ён накіраваны супраць народу Майго, супраць усіх князёў
Ізраіля. Яны аддадзеныя на меч разам з народам Маім. Таму ўдар сябе па сьцёгнах,
13 бо выпрабаваньне надыйшло. І што, калі ён пагарджае скіпетрам? Ён не ўстаіць, кажа
Госпад ГОСПАД”.
14 І ты, сыне чалавечы, прароч і ўдар далоняй у далонь, і няхай меч падвоіць, і няхай меч
патроіць забітых. Гэта меч забіваньня вялікага, які паварочваецца навокал іх.
15 Каб сэрца млела, каб памнажаліся забітыя, у-ва ўсіх брамах іхніх Я пастаўлю меч на зарэз,
вычышчаны як бліскавіца, завостраны, каб забіваць.
16 “Сячы направа і ўдарай налева, туды, куды вострыва тваё скіраванае”.
17 І Я таксама буду біць далоняй Маёй у далонь, і заспакою лютасьць Маю. Я, ГОСПАД, прамовіў
[гэта]».
18 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
19 «А ты, сыне чалавечы, вызнач два шляхі, па якіх пойдзе меч валадара Бабілонскага. Абодва
выйдуць з адной зямлі. І пастаў [дарожны] знак, на пачатку шляху ў горад пастаў [яго].
20 Падрыхтуй шлях, па якім пойдзе меч у Раббу сыноў Амона і ў Юду, і ў Ерусалім умацаваны.

21 Бо стаіць валадар Бабілонскі на раздарожжы, на пачатку двух шляхоў, каб атрымаць
прадказаньне, ён кідае стрэлы, пытаецца ў тэрафімаў і прыглядаецца да вантробаў.
22 У правай руцэ ягонай прадказаньне: “Ерусалім”, каб паставіць тараны, адкрыць вусны
ў крыку баявым, узь- няць голас гармідару ваеннага, паставіць тараны супраць брамаў,
насыпаць вал і збудаваць вежы.
23 І будзе [падавацца] марным у вачах іхніх прадказаньне гэтае, бо яны прысягаю
запрысягнулі [яму], але ён памятае пра беззаконьне [іхняе], каб яны былі схопленыя.
24 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Каб вы ўзгадалі беззаконьні вашыя, і каб злачынствы
вашыя сталіся яўныя, і каб грахі вашыя ў-ва ўсіх паводзінах вашых былі відочныя, каб вы
ўзгадалі [гэта], далоняй [варожай] вы будзеце схопленыя”.
25 А табе, нягодны бязбожнік, князь Ізраіля, якога дзень прыходзіць у час беззаконьня
апошняга,
26 гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Здымі мітру, скінь карону, бо гэтага ня [будзе больш].
Прыніжанае будзе ўзвышана, а ўзвышанае — прыніжана.
27 Руіну, руіну, руіну зраблю з цябе; падобнага ня будзе, пакуль ня прыйдзе той, да якога
[належыць суд], і якому Я аддам яго”.
28 А ты, сыне чалавечы, прароч і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД адносна сыноў Амона
і адносна зьнявагі іхняй”. І скажаш: “Меч, меч выхаплены [з похваў] для забіваньня,
адшліфаваны для вынішчэньня і бляску.
29 У гэты час для цябе бачаць відзежы пустыя і прадказваюць падман, каб апусьціць меч на
карак бязбожнікаў, якіх дзень прыйдзе ў час беззаконьня апошняга.
30 Схавай вострыва ягонае ў похвы. У месцы, дзе ты быў створаны, і ў зямлі, дзе ты нарадзіўся,
буду судзіць цябе.
31 І выльлю на цябе гнеў Мой, распалю супраць цябе ярасьць, і аддам цябе ў рукі людзей
раз’ятраных для гвалту і зьнішчэньня.
32 Ты будзеш спажывай для агню, кроў твая будзе пасярод зямлі, і не пакінеш пасьля сябе
ўспаміну, бо Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта]”».

Эзк 22

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «А ты, сыне чалавечы, ці будзеш судзіць? Ці будзеш судзіць горад крыві? Пакажы яму ўсе
брыдоты ягоныя,
3 і скажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Горад, які разьлівае кроў пасярод сябе, каб гэтым
наблізіць час свой, і робіць ідалаў для сябе, каб паганіцца [імі].
4 Крывёю тваёй, якую ты праліў, ты саграшыў, і ідаламі тваімі, якіх ты зрабіў, ты апаганіўся.
І ты наблізіў дні твае, і прыйшлі гады твае. Таму Я аддам цябе на ганьбу сярод народаў і на
пасьмешышча для ўсіх земляў.
5 Блізкія і далёкія ад цябе будуць сьмяяцца з цябе, [горад] з нячыстым імем і поўны
замяшаньня.
6 Вось, князі Ізраіля, кожны ў [сіле] рамяна свайго, былі ў табе, каб разьліваць кроў.
7 Бацька і маці зьневажаюцца ў цябе, прыхадню робяць крыўду пасярод цябе, сірата і ўдава
прыгнятаныя ў цябе.
8 Сьвятыні Мае ты зневажаеш і суботы Мае зьнеслаўляеш.
9 Паклёпнікі ёсьць у цябе, каб праліваць кроў, на гарах ядуць у цябе і робяць распусту пасярод
цябе.
10 Голасьць бацькі адкрываецца ў цябе, [жанчыну] ў пару нячыстасьці ейнай гвалцяць у цябе.
11 Адзін робіць брыдоту з жонкай бліжняга свайго, другі пляміцца распустай з нявесткай
сваёй, а іншы гвалтуе ў цябе сястру сваю, дачку бацькі свайго.
12 Прыймаюць падарункі ў цябе, каб праліваць кроў, ты бярэш адсоткі і ліхву, рабуеш і
ўціскаеш бліжняга свайго, а пра Мяне забываешся, кажа Госпад ГОСПАД.

13 Вось, Я ўдару ў далоні Мае з прычыны набыткаў, якія ты зьбіраеш, і з прычыны крыві, якая
[праліваецца] пасярод цябе.
14 Ці ўстаіць сэрца тваё? Ці будуць рукі твае моцныя ў тыя дні, калі Я вазьмуся за цябе? Я,
ГОСПАД, прамовіў [гэта] і зраблю.
15 І Я расьцярушу цябе сярод народаў, і раскідаю паміж земляў, і прыму з цябе нячыстасьць
тваю.
16 І ты будзеш зьняслаўлены на вачах народаў, і даведаешся, што Я — ГОСПАД”».
17 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
18 «Сыне чалавечы, дом Ізраіля стаўся для Мяне як жужаль; усе яны — медзь, цына, жалеза і
волава ў сярэдзіне горана, сталіся яны жужалем ад срэбра.
19 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што ўсе вы сталіся жужалем, Я зьбяру вас у
сярэдзіне Ерусаліму.
20 Як зьбіраюць разам у горане срэбра, медзь, жалеза, волава і цыну, каб распаліць унізе агонь
і растапіць іх, так і Я зьбяру вас у гневе Маім і абурэньні Маім, і пакладу вас, і растаплю.
21 І Я зьбяру вас, і распалю супраць вас агонь гневу Майго, і вы будзеце растопленыя ў сярэдзіне
[гораду].
22 Як срэбра топіцца ў сярэдзіне горана, так і вы будзеце растопленыя ў сярэдзіне яго, і
даведаецеся, што Я, ГОСПАД, выліў на вас лютасьць Маю”».
23 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
24 «Сыне чалавечы, скажы [зямлі Ізраіля]: “Ты — зямля неачышчаная, ты не была абмытая
дажджом у дзень гневу.
25 Змова прарокаў ейных пасярод яе, яны як ільвы рыклівыя, што разьдзіраюць здабычу; яны
жаруць душы, забіраюць багацьці і каштоўнасьці і памнажаюць удоваў пасярод яе.
26 Сьвятары ейныя парушаюць Закон Мой, паганяць сьвятыні Мае, не аддзяляюць сьвятое ад
несьвятога і не адрозьніваюць чыстага ад нячыстага, і ад суботаў Маіх адвярнулі вочы свае, і
Я зьняважаны сярод іх.
27 Князі ейныя пасярод яе як ваўкі, якія разьдзіраюць здабычу; яны разьліваюць кроў,
забіваюць душы, здабываюць набытак [няправедны].
28 А прарокі ейныя пакрываюць усё тынкам, бачаць відзежы марныя і прадказваюць
фальшыва, кажуць: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД”, а ГОСПАД не прамаўляў.
29 Народ зямлі гэтай уціскаюць уціскам і рабуюць рабункам, крыўдзяць убогага і беднага, і
прыхадня прыгнятаюць беззаконна.
30 І Я шукаў сярод іх чалавека, які паставіў бы мур і стаў бы ў выломе перад абліччам Маім за
зямлю гэтую, каб Я ня зьнішчыў яе, і не знайшоў.
31 І Я выліў на іх гнеў Мой, у агні абурэньня Майго вынішчу іх, шляхі іхнія ўскладу на галовы
іхнія, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 23

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы! Былі дзьве жанчыны, дочкі адной маці.
3 І яны распусьнічалі ў Эгіпце, ад маладосьці сваёй распусьнічалі. Там ціскалі грудзі іхнія і
там тапталі дзявочыя ўлоньні іхнія.
4 А імёны іхнія: Аголя, старэйшая, і Агаліва, сястра ейная. І сталіся яны Маімі, і нарадзілі
сыноў і дачок. Імёны іхнія: Аголя — Самарыя, а Агаліва — Ерусалім.
5 І чужаложыла Аголя каля стопаў Маіх, і загарэлася пажаданьнем да палюбоўнікаў сваіх
Асірыйцаў, суседзяў сваіх,
6 да магнатаў і намесьнікаў, апранутых у пурпур, да юнакоў прывабных і ўсіх вершнікаў, якія
сядзяць на конях.
7 І аддавалася яна ў распусьце сваёй усім найлепшым сынам Асірыі і з усімі, якіх пажадала, з
імі ўсімі паганілася.
8 І не пакінула распусты сваёй з Эгіптам, бо там спалі з ёй у маладосьці ейнай, і тапталі ўлоньне
ейнае дзявочае, і вылівалі на яе распусту сваю.

9 Дзеля гэтага Я аддаў яе ў рукі палюбоўнікаў ейных, у рукі сыноў Асірыі, да якіх мела пажаданьне.
10 Яны адкрылі голасьць ейную, забралі сыноў ейных і дочак ейных, а яе забілі мячом, і сталася
яна ганьбаю для жанчынаў, і ўчынілі над ёю суд.
11 І бачыла гэта сястра ейная Агаліва, і паганілася пажаданьнем сваім больш за яе, і распуста
ейная [была большая], чым чужалоства сястры ейнай.
12 Яна [запалала] пажаданьнем да сыноў Асірыі, да магнатаў і намесьнікаў, суседзяў багата
апранутых, да вершнікаў, якія сядзяць на конях, да ўсіх юнакоў прывабных.
13 І ўбачыў Я, што яна апаганілася і што абедзьве ідуць тою самай дарогай.
14 І дадала яна да распусты сваёй, калі ўбачыла на сьцяне намаляваных мужчынаў, маляваныя
чырвонай фарбай абразы Халдэйцаў,
15 якія падперазаныя вакол сьцёгнаў сваіх паясамі, з вялікімі завоямі на галовах, усіх з выгляду
мужных ваяроў, абразы сыноў Бабілону, якія родам з зямлі Халдэйскай.
16 І пажаданьнем пажадала яна іх з прычыны абраза, які бачылі вочы ейныя. І выправіла
пасланцоў да іх, у Халдэю.
17 І прыйшлі да яе сыны Бабілону на ложак каханьня, і спаганілі яе распустай сваёй, а калі яна
апаганілася з імі, душа ейная адвярнулася ад іх.
18 І выявіла яна распусту сваю, і адкрыла сорам свой, і душа Мая адвярнулася ад яе, як
адвярнулася душа Мая ад сястры ейнай.
19 І памнажала яна распусту сваю, калі ўзгадала дні маладосьці сваёй, калі яна чужаложыла ў
зямлі Эгіпецкай.
20 І [запалала] пажаданьнем да палюбоўнікаў сваіх, у якіх чэлясы — чэлясы аслоў і юр іхні —
юр коняў.
21 І ты шукала распусты маладосьці тваёй, калі ў Эгіпце тапталі ўлоньне тваё і ціскалі грудзі
маладосьці тваёй.
22 Дзеля гэтага, Агаліва, так кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я падыму супраць цябе палюбоўнікаў
тваіх, ад якіх адвярнулася душа твая; зьбяру іх супраць цябе з усіх бакоў,
23 сыноў Бабілону і ўсіх Халдэйцаў, Пэкод, Шоа і Коа, усіх сыноў Асірыі, прывабных юнакоў,
магнатаў і намесьнікаў, усіх ваяроў магутных, слаўных мужоў, якія сядаюць на коней.
24 І прыйдуць на цябе з поўначы на вазах жалезных і калясьніцах, і з дружынамі народаў. У
панцырах, са шчытамі і шаломамі стануць адусюль супраць цябе. І Я дам перад абліччам іхнім
суд, і яны будуць судзіць цябе паводле судоў сваіх.
25 І Я зьвярну супраць цябе лютасьць Маю, і яны будуць абыходзіцца з табою ў гневе, адрэжуць
табе нос і вушы, а тое, што ў табе застанецца, упадзе ад мяча. Яны забяруць сыноў тваіх і дочак
тваіх, а рэшту тваю зьнішчыць агонь.
26 І Я здыму з цябе шаты твае, і забяру каштоўныя аздобы твае.
27 І Я спыню распусту тваю ў цябе і чужалоства тваё з зямлі Эгіпецкай, і ты не падымеш на іх
вачэй тваіх і больш не ўзгадаеш пра Эгіпет.
28 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Вось, Я аддаю цябе ў рукі таго, каго ты ненавідзіш, у рукі тых,
ад якіх адвярнулася душа твая".
29 І яны будуць абыходзіцца з табою з нянавісьцю, забяруць усе набыткі твае і пакінуць цябе
голай і неакрытай, і выявіцца голасьць юрлівасьці тваёй, распуснасьць твая і чужалоства тваё.
30 І зробяць гэта табе, бо ты распусьнічала з народамі і паганілася ідаламі іхнімі,
31 і пайшла па шляху сястры тваёй, і Я дам келіх ейны ў рукі твае.
32 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Келіх сястры тваёй ты будзеш піць, глыбокі і шырокі, і станеш
ты на насьмешку і на зьдзек, [бо] шмат зьмясьцілася [ў ім].
33 Ап’яненьнем і болем будзеш напоўненая, [бо гэта] келіх спусташэньня і смутку, келіх
сястры тваёй, Самарыі.
34 І вып’еш яго аж да дна, і ў кавалкі разаб’еш яго, і грудзі свае скалечыш, бо Я прамовіў [гэта],
кажа Госпад ГОСПАД".

35 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "За тое, што ты забылася пра Мяне і кінула Мяне за
плечы свае, ты насі цяпер распусту тваю і чужаложнасьць тваю""».
36 І сказаў мне ГОСПАД: «Сыне чалавечы, ці будзеш судзіць Аголю і Агаліву? Выяві ім брыдоту
іхнюю.
37 Бо яны чужаложылі і кроў на руках іхніх, і чужаложылі яны з ідаламі сваімі, а таксама сыноў
сваіх, якіх для Мяне нарадзілі, яны праводзілі [праз агонь] на спажыву ім.
38 Яшчэ гэта яны зрабілі Мне: сьвятыню Маю апаганілі ў той дзень і зьняважылі суботы Мае.
39 Бо калі яны ахвяроўвалі сыноў сваіх ідалам сваім, у той самы дзень прыходзілі ў сьвятыню
Маю, паганячы яе. Вось так яны рабілі ў сярэдзіне Дому Майго.
40 І нават пасылалі па мужчынаў чужых і далёкіх, і як толькі пасланец быў пасланы да іх, яны
адразу прыходзілі. Дзеля іх ты мылася, фарбавала вочы свае і апраналася аздобна,
41 і сядала на каштоўным ложку, і пры ім быў застаўлены стол, і ставіла на ім кадзіла Маё і
алей Мой.
42 І галасы натоўпу [былі] там, а да мужчынаў натоўпу таго прыводзілі п'яніцаў з пустыні, і
яны ўскладалі бранзалеты на рукі свае і ўпрыгожаныя кароны на галовы свае.
43 І Я сказаў да той, якая нішчыла сябе чужалоствам: "Ці будзе яна [яшчэ], распусьнічаючы,
чыніць распусту?"
44 І прыходзяць да яе так, як прыходзяць да жанчыны чужаложніцы. Так прыходзілі да Аголі і
Агалівы, жанчынаў распусных.
45 І мужы праведныя будуць судзіць іх судом чужаложніцаў і судом тых, якія разьліваюць кроў,
бо яны чужаложылі і кроў на руках іхніх.
46 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Склічуць супраць іх супольны сход і аддадуць іх на страхоцьце
і на рабунак,
47 і сход гэты закідае іх камянямі, пасячэ іх мячамі, заб'е сыноў іхніх і дочак іхніх, а дамы іхнія
спаліць агнём.
48 І Я спыню распусту ў зямлі гэтай, і будуць навучаныя ўсе жанчыны і ня будуць чыніць
распусту, [падобную] да распусты іхняй.
49 І пакладуць яны на вас распусту вашую, і будзеце насіць грахі ідалаў вашых, і даведаецеся,
што Я — Госпад ГОСПАД"».

Эзк 24

1 І было слова ГОСПАДА да мяне ў дзявятым годзе, у дзясятым месяцы, у дзясяты [дзень]
месяца, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, напішы сабе імя дня гэтага, гэтага вось дня, бо валадар Бабілонскі ў дзень
гэты пачаў аблогу Ерусаліму.
3 І раскажы гэтаму дому бунтаўнікоў прыповесьць, і скажы ім: "Гэта кажа Госпад ГОСПАД.
Пастаў кацёл на агонь, пастаў і налі ў яго вады.
4 Укінь у яго кавалкі мяса, усе лепшыя кавалкі, кумпяк і лапатку, напоўні яго найлепшымі
косткамі.
5 І вазьмі на гэта найлепшых з авечак, падкладзі [дровы] пад спод так, каб аж косткі
разварыліся".
6 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Гора гораду крыві, катлу, на якім іржа і з якога ржа не зыходзіць.
Павыкідай з яго кавалак за кавалкам, жэрабя на іх ня будзе кідацца.
7 Бо кроў ягоная ў сярэдзіне яго, ён разьліў яе на голай скале, ня выліў яе на зямлю, каб
прыкрыць яе пылам.
8 Каб распаліць гнеў і адпомсьціць помсту, Я разальлю кроў ягоную на голай скале, каб не была
яна прыкрыта".
9 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: "Гора гораду крыві! Я таксама павялічу вогнішча.
10 Назьбірай дроваў, распалі агонь, звары мяса, запраў прыправамі, і няхай косткі згараць.
11 І пастаў гэты кацёл пусты на вугольлі, каб ён разагрэўся і разгарэлася медзь ягоная, каб у
нутры ягоным растапілася нячыстасьць ягоная і каб зьнікла іржа ягоная.
12 Дарэмная праца, і ня зыйдзе з яго мноства іржы, у агні [застаецца] іржа.

13 У нячыстасьці тваёй распуста. Хоць Я чысьціў цябе, але ты не ачысьціўся ад нячыстасьці
тваёй. Дзеля гэтага ня будзеш ачышчаны, пакуль не супакоіцца лютасьць Мая супраць цябе.
14 Я, ГОСПАД, прамовіў, і прыйдзе [гэта]. І Я зраблю, не занядбаю, і ня буду мець літасьці, і
ня буду мець спачуваньня. Будзеш асуджаны паводле шляхоў тваіх і паводле ўчынкаў тваіх,
кажа Госпад ГОСПАД”».
15 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
16 «Сыне чалавечы, вось, Я адбяру у цябе раптам радасьць вачэй тваіх, але ты не галасі і ня
плач, і няхай не цякуць сьлёзы твае.
17 Стагні моўчкі, не рабі жалобы па памёршым, завяжы турбан твой на сабе, азуй сандалы твае
на ногі твае, не прыкрывай барады і ня еш хлеба жалобы».
18 І прамаўляў я да народу раніцаю, а ўвечары памерла жонка мая. І я зрабіў назаўтра так, як
мне загадана.
19 І народ казаў мне: «Ці ня вытлумачыш нам, што значыць для нас тое, што ты робіш?»
20 І я сказаў ім: «Слова ГОСПАДА было да мяне, кажучы:
21 “Скажы дому Ізраіля: "Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я апаганю сьвятыню Маю,
велічнасьць сілы вашай, радасьць вачэй вашых, прагненьне душаў вашых. А сыны вашыя і
дочкі вашыя, якіх вы пакінулі, ад мяча загінуць.
22 І вы гэтак зробіце, як я зрабіў: барады ня будзеце прыкрываць, ня будзеце есьці хлеба
жалобы,
23 турбаны вашыя [будуць] на галовах вашых і сандалы вашыя на нагах вашых, ня будзеце
лямантаваць і ня будзеце плакаць, а будзеце сохнуць дзеля беззаконьняў вашых і будзеце
стагнаць адзін перад адным.
24 І будзе Эзэкіэль для вас знакам. Тое, што ён зрабіў, будзеце і вы рабіць, калі гэта прыйдзе, і
даведаецеся, што Я — Госпад ГОСПАД".
25 А ты, сыне чалавечы, у дзень, калі Я забяру ад іх сілу іхнюю і радасьць аздобы іхняй, і
раскошу вачэй іхніх, і прагненьне душаў іхніх, сыноў іхніх і дочак іхніх,
26 ў той дзень прыйдзе да цябе ўцякач, каб паведаміць вушам тваім [пра гэта].
27 У той дзень адкрыюцца вусны твае перад уцекачом, і ты будзеш прамаўляць, і ня будзеш
ужо немы. І ты будзеш для іх знакам, і яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД”».

Эзк 25

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, павярні аблічча тваё да сыноў Амона і прароч супраць іх.
3 І скажаш сынам Амона: “Слухайце слова Госпада ГОСПАДА. Гэта кажа Госпад ГОСПАД. За тое,
што ты казаў “Ага!” на сьвятыню Маю, бо яна апаганена, і на зямлю Ізраіля, бо яна спустошана,
і на дом Юды, бо ён пайшоў у няволю,
4 вось, Я аддам цябе сынам Усходу ў спадчыну. І яны разложаць табары свае ў цябе, і паставяць
сялібы свае ў цябе, яны будуць есьці плады твае і піць малако тваё.
5 І Я зраблю Раббу пашаю для вярблюдаў, а сыноў Амона — логавішчам для авечак, і
даведаецеся, што Я — ГОСПАД”.
6 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што ты пляскаў рукамі і тупаў нагамі, і цешыўся ў душы з
усёй пагардай тваёй з зямлі Ізраіля,
7 вось, Я выцягну руку Маю супраць цябе, і аддам цябе на рабунак народам, і выкарчую цябе
спаміж народаў, і вынішчу цябе спасярод земляў, і выгублю цябе, і даведаешся, што Я —
ГОСПАД”.
8 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што Мааў і Сэір казалі: “Вось, дом Юды [такі самы] як усе
[іншыя] народы”,
9 вось, Я адкрыю [шлях] на ўзбоччы Мааву ад гораду і да гораду ягонага ў межах ягоных, да
аздобы зямлі гэтай: Бэт-Ешымоту, Баал-Мэону і Кірыятаіму,
10 і аддам іх разам з сынамі Амона ў спадчыну сынам Усходу, каб ня ўзгадвалі сыноў Амона
між народамі.
11 І Я ўчыню суды над Маавам, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД”.

12 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што Эдом гарэў помстай супраць дому Юды, і помсьцячы
яму, правініўся віною,
13 дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Я выцягну руку Маю супраць Эдому, і вынішчу ў ім
чалавека і жывёлу, і аддам яго на спусташэньне, ад Тэману аж да Дэдану пагінуць ад мяча.
14 І Я ўчыню помсту Маю Эдому паводле гневу Майго і паводле абурэньня Майго, і яны
пазнаюць помсту Маю, кажа Госпад ГОСПАД”.
15 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: ”За тое, што Філістынцы рабілі [Юдзе] ў помсьце, і помсьцілі
помстаю з пагардай у душы, і забівалі дзеля спрадвечнай нянавісьці,
16 дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Вось Я выцягну руку Маю супраць Філістынцаў,
выкарчую Керэтаў і зьнішчу рэшту ўзьбярэжжа марскога.
17 І Я ўчыню ім помсту вялікую карамі лютымі. І яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі Я
ўчыню ім помсту Маю”».

Эзк 26

1 І сталася ў адзінаццатым годзе, у першы [дзень] месяца, і было слова ГОСПАДА да мяне,
кажучы:
2 «Сыне чалавечы, за тое, што Тыр сказаў Ерусаліму: “Ага! Зламаная брама народаў; ён
зьвяртаецца да мяне, я буду багаты, бо ён спустошаны”,
3 дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я супраць цябе, Тыр, і Я прывяду супраць цябе
народы шматлікія, як мора ўздымае хвалі свае.
4 І яны зруйнуюць муры Тыру, і разваляць вежы ягоныя. І Я вымяту з яго пыл ягоны, і зраблю
з яго голую скалу.
5 Ён станецца пасярод мора месцам, каб сушыць сеткі, бо Я прамовіў [гэта], кажа Госпад
ГОСПАД, і будзе ён здабычай для народаў.
6 Дочкі ягоныя, якія на полі, пагінуць ад мяча, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД”.
7 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я прывяду з поўначы супраць Тыру Навухаданосара,
валадара Бабілону, валадара валадароў, з коньмі, калясьніцамі і вершнікамі, з войскам і
мноствам народу.
8 І дочак тваіх, якія на полі, ён заб’е мячом, і паставіць супраць цябе вежу, і насыпле супраць
цябе вал, і паставіць супраць цябе шчыт.
9 А галавіцу таранаў сваіх ён наставіць супраць муроў тваіх, і вежы твае разваліць мячамі
сваімі.
10 Ад мноства коней ягоных пакрые цябе куродым іхні, ад грукату вершніка, колаў і
калясьніцаў будуць дрыжаць муры твае, калі яны будуць уваходзіць у брамы твае, як пры
ўваходзе ў здабыты горад.
11 Капытамі коней сваіх ён паб’е ўсе вуліцы твае, народ твой мячом пазабівае, а слупы
магутнасьці тваёй паваліць на зямлю.
12 І разрабуюць багацьці твае, і забяруць тавары твае, і зруйнуюць муры твае, і дамы твае
багатыя разбураць, а камяні твае, і дрэва тваё, і парахно тваё кінуць у сярэдзіну мора.
13 І Я спыню гук сьпеваў тваіх, і голас гусьляў тваіх ня будзе больш чутны.
14 І Я зраблю з цябе голую скалу, і ты станешся месцам, каб сушыць сеткі, больш ня будзеш
адбудаваны, бо Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта], кажа Госпад ГОСПАД”.
15 Гэта кажа Госпад ГОСПАД Тыру: “Ці ад гуку руйнаваньня твайго, калі будуць стагнаць
параненыя, калі забіваньнем будуць забіваць пасярод цябе, не задрыжаць астравы?
16 І зыйдуць з вышыні пасадаў сваіх усе князі мора, скінуць з сябе плашчы свае, здымуць з
сябе вышываныя шаты, апрануцца ў страх, сядуць на зямлі, і будуць дрыжаць без перапынку,
і трэсьціся будуць з тваёй прычыны.
17 Яны будуць галасіць дзеля цябе і скажуць табе: “Як ты загінуў, як адарваны ад мора, горад
слаўны, які быў моцным на моры, ты і жыхары твае, якія прыносілі страх свой усім жыхарам
ягоным!
18 Цяпер дрыжаць астравы ў дзень загубы тваёй; стрывожыліся астравы, якія на моры,
адыходам тваім”.

19 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Калі Я зраблю цябе горадам спустошаным, як гарады, у якіх
ніхто не жыве, калі навяду на цябе бездань, і накрыюць цябе воды вялікія,
20 Я скіну цябе да тых, якія зыйшлі ў магілу, да людзей старадаўніх, і пасялю цябе ў зямлі
падземнай, як руіны адвечныя, з тымі, якія зыйшлі ў магілу, каб [больш] ня быў ты заселены
і ня меў славы ў зямлі жывых.
21 Я зраблю цябе страхоцьцем, і ня будзе цябе. І будуць шукаць [цябе], і ня знойдуць ніколі, на
вякі, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 27

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «А ты, сыне чалавечы, узьнімі лямант дзеля Тыру
3 і скажы Тыру, які жыве каля ўваходу ў мора і гандлюе з народамі на астравах шматлікіх:
“Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Тыр, ты сказаў: “Я — [карабель] дасканалай прыгажосьці!”
4 У сэрцы мора межы твае, будаўнікі твае збудавалі прыгажосьць тваю.
5 З кіпарысаў Сэнірскіх пабудавалі табе ўсе барты, узялі кедры Лібанскія, каб зрабіць табе
мачты,
6 з дубоў Башанскіх зрабілі вёслы твае, паклад твой зрабілі з косьці слановай, з самшыта з
астравоў Кіттым.
7 З вісону аздобнага Эгіпецкага зрабілі ветразь твой, каб быў для цябе сьцягам. Блакіт і пурпур
з астравоў Эліша былі накрыцьцём тваім.
8 Жыхары Сідону і Арваду былі ў цябе весьлярамі. Мудрацы твае, Тыр, былі ў цябе, яны —
мараплаўцы твае.
9 Старшыні Гэбалю і мудрацы ягоныя былі пры табе, каб напраўляць пашкоджаньні твае. Усе
караблі марскія і маракі іхнія былі пры табе, каб гандляваць таварамі тваімі.
10 Пэрсы, Люд і Пут былі ў войску тваім ваярамі. Шчыты і шаломы яны завешвалі ў цябе і
дадавалі табе славы.
11 Сыны Арваду і войска тваё [былі] кругом на мурах тваіх, а Гамадэйцы — на вежах тваіх; яны
вешалі шчыты свае кругом на мурах тваіх, завяршаючы аздобу тваю.
12 Таршыш гандляваў з табой дзеля мноства ўсякага багацьця; срэбра і жалеза, цыну і волава
давалі [табе] за тавары твае.
13 Яван, Туваль і Мэшэк вялі гандаль з табой, душу чалавека і вырабы з медзі яны давалі за
тавары твае.
14 З Бэт-Тагармы прыводзілі коней, і вершнікаў, і мулаў за тавары твае.
15 Сыны Дэдану вялі гандаль з табою, і шматлікія астравы гандлявалі з табою. Косьць слановую
і дрэва гэбан прыносілі як даніну.
16 Арам гандляваў з табою дзеля мноства вырабаў тваіх, давалі за тавары твае пэрліны, пурпур,
рознакаляровыя тканіны, ядваб, каралі і рубіны.
17 Юда і зямля Ізраіля вялі гандаль з табою, давалі за тавары твае пшаніцу з Мініту, слодычы,
мёд, алей і бальзам.
18 Дамаск гандляваў з табой дзеля мноства вырабаў тваіх і мноства багацьця твайго, віно з
Хэльбону і воўну з Цахару [давалі табе].
19 Дан і Яван з Уззалю за тавары твае давалі табе жалеза абробленае, цынамон і трысьнёг як
тавары для гандлю твайго.
20 Дэдан вёў гандаль з табою, дыванкі для сёдлаў [даваў табе].
21 Арабія і ўсе князі Кедару куплялі з рукі тваёй, ягнятамі, баранамі і казламі гандлявалі з
табою.
22 Купцы з Шэвы і Рамы вялі гандаль з табою, давалі за тавары твае найлепшы бальзам, і
ўсялякія каштоўныя камяні, і золата.
23 Харан, Каннэ і Эдэн, купцы з Шэвы, Асірыі і Кільмаду гандлявалі з табой.
24 Яны вялі гандаль з табою, [прывозілі] каштоўныя строі, плашчы з пурпуру, рознакаляровыя
тканіны і дываны, скураныя моцныя шнуры на рынак твой.

25 Караблі з Таршышу прывозілі да цябе тавары твае. І стаўся ты багаты і вельмі слаўны ў
сэрцы мораў.
26 У воды вялікія завялі цябе весьляры твае, вецер усходні разьбіў цябе ў сэрцы мораў.
27 Багацьце тваё, тавары твае, гандаль твой, маракі твае і корнікі твае, тыя, што напраўляюць
выломы твае, і тыя, што гандлююць таварам тваім, усе ваяры твае, якія ў табе, і ўсё войска
тваё, якое пасярод цябе, патопяцца ў сэрцы мораў у дзень падзеньня твайго.
28 Ад голасу крыку маракоў тваіх задрыжаць узьбярэжжы.
29 І пазыходзяць з караблёў сваіх усе весьляры, маракі і ўсе корнікі марскія стануць на зямлі,
30 і загалосяць дзеля цябе гучна, і будуць крычаць горка, і будуць сыпаць пыл на галовы свае,
і будуць качацца ў попеле.
31 І паголяць дзеля цябе галовы сабе, і падпярэжуцца зрэбніцай. І будуць плакаць па табе з
горкай душой, галосячы горка.
32 І ўзьнясуць па табе лямант, і будуць сьпяваць у жалобе: “Хто ж такі, як Тыр, [які] зруйнаваны
пасярод мораў!”
33 Калі тавары твае выходзілі з мора, ты карміў шмат народаў! Дзеля мноства багацьцяў тваіх
і тавараў тваіх ты ўзбагаціў валадароў зямлі.
34 Цяпер ты разьбіты ў моры, і ў глыбіні водаў тавары твае, і ўсё войска тваё, якое ў сярэдзіне
цябе, загінула.
35 Усе жыхары астравоў аслупянелі дзеля цябе, а валадары іхнія затрымцелі ад жаху,
затрэсьліся абліччы [іхнія].
36 Купцы з [розных] народаў сьвішчуць дзеля цябе; стаўся ты страхоцьцем для іх, і ня будзе
цябе на вякі”».

Эзк 28

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, скажы князю Тыру: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што ўзьвялічылася
сэрца тваё і ты сказаў: “Я — бог, я сяджу на пасадзе Божым у сэрцы мораў!” Але ты чалавек, а
ня бог, і ты паставіў сэрца тваё як сэрца Бога.
3 Вось, ты мудрэйшы за Даніила, ніякая таямніца не схаваная ад цябе!
4 Мудрасьцю тваёй і розумам тваім ты здабыў сабе багацьце і назьбіраў золата і срэбра ў
скарбніцах тваіх.
5 Вялікай мудрасьцю тваёй у гандлі тваім ты памножыў багацьце тваё, і сэрца тваё
ўзьвялічылася з прычыны багацьцяў тваіх.
6 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што ты сэрца тваё паставіў як сэрца Бога,
7 вось, Я прывяду на цябе чужынцаў, найгоршыя народы. Яны павернуць мячы свае супраць
прыгажосьці мудрасьці тваёй і збэсьцяць бляск твой,
8 і сапхнуць цябе ў яму, і памрэш ты сьмерцю забітага ў сэрцы мораў.
9 Ці будзеш гаварыць. “Я — Бог!” перад абліччам таго, які забівае цябе. Ты чалавек, а ня Бог у
руцэ забойцаў тваіх.
10 Сьмерцю неабрэзаных ты памрэш ад рукі чужынцаў, бо Я прамовіў [гэта], кажа Госпад
ГОСПАД”».
11 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
12 «Сыне чалавечы, узьнімі лямант над валадаром Тыру і скажы яму: “Гэта кажа Госпад
ГОСПАД. Ты — пячатка дасканаласьці, поўны мудрасьці, вяршыня прыгажосьці.
13 Ты быў у Эдэме, у садзе Божым, усялякія камяні дарагія пакрывалі цябе: рубін, тапаз, ясьпіс,
таршыш, онікс, бэрыль, шафір, гранат, шмарагд і золата, былі зробленыя бубны твае, і дуды
твае былі падрыхтаваныя для цябе ў дзень стварэньня твайго.
14 Ты — памазаны херувім, які асланяе, і Я даў табе быць на сьвятой гары Божай, і ты хадзіў
між агністых камянёў.
15 Ты быў дасканалы ў шляхах тваіх ад дня стварэньня твайго, пакуль не знайшлося ў табе
беззаконьне.

16 З пашырэньнем гандлю твайго напоўнілася нутро тваё гвалтам, і ты саграшыў. І Я скінуў
цябе з гары Божай, і выгнаў цябе, херувім, які асланяе, спаміж агністых камянёў.
17 Узьвялічылася сэрца тваё дзеля прыгажосьці тваёй; і ты згубіў мудрасьць тваю дзеля красы
тваёй. І Я кінуў цябе на зямлю, перад абліччам валадароў паставіў цябе, каб бачылі цябе.
18 Мноствам беззаконьняў тваіх і няправеднасьцю гандлю твайго ты апаганіў сьвятыню тваю.
І Я вывеў агонь з нутра твайго, і ён зьеў цябе, і Я зрабіў цябе попелам на зямлі на вачах усіх,
якія бачылі цябе.
19 Усе, хто ведае цябе сярод народаў, аслупянеюць дзеля цябе, бо ты стаўся страхоцьцем, і ня
будзе цябе на вякі”».
20 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
21 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на Сідон і прароч супраць яго,
22 і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць цябе, Сідоне. І Я ўслаўлюся пасярод
цябе, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі ўчыню ў ім суды [Мае] і зьяўлю сьвятасьць [Маю] ў
ім.
23 І Я спашлю на яго пошасьць і кроў на вуліцы ягоныя, і будуць падаць пасярод яго забітыя ад
мяча, які [прыйдзе] да яго з усіх бакоў, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД.
24 І ўжо больш ня будзе для дому Ізраіля церня калючага і асоту, які прыносіць боль, ад усіх,
якія вакол яго і якія пагарджаюць ім, і яны даведаюцца, што Я — Госпад ГОСПАД.
25 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Калі Я зьбяру дом Ізраіля спаміж народаў, сярод якіх яны былі
расьцярушаныя, Я зьяўлю сьвятасьць [Маю] на вачах усіх народаў, і яны будуць жыць на зямлі
сваёй, якую Я даў слузе Майму Якубу.
26 І будуць жыць у ёй бясьпечна, будуць будаваць дамы, будуць садзіць вінаграднікі; будуць
жыць бясьпечна ў той час, калі над усімі вакол, хто пагарджае імі, Я буду праводзіць суд, і
даведаюцца, што Я — ГОСПАД, Бог іхні”».

Эзк 29

1 У дзясятым годзе, у дзясятым [месяцы], у дванаццаты [дзень] месяца было слова ГОСПАДА
да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё на фараона, валадара Эгіпту, і прароч супраць яго і
супраць усяго Эгіпту,
3 і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць цябе, фараон, валадар Эгіпту, цмок вялікі,
які ляжыш сярод рэкаў сваіх і кажаш: “Для мяне рэкі мае, я іх зрабіў!”
4 Я ўкладу крукі ў шчэляпы твае, і прыляплю рыбаў рэкаў тваіх да лускі тваёй, і выцягну з
сярэдзіны рэкаў тваіх цябе і ўсіх рыбаў тваіх, якія прыстануць да лускі тваёй.
5 І выкіну цябе ў пустыню, цябе і ўсіх рыбаў рэкаў тваіх, і ўпадзеш ты на аблічча поля, і ня
будзеш сабраны, і ня будзеш зграмаджаны. Зьвярам зямлі і птушкам нябесным Я аддам цябе
на жыраваньне.
6 І даведаюцца ўсе жыхары Эгіпту, што Я — ГОСПАД, бо яны былі апорай з чароту для дому
Ізраіля.
7 Калі яны хапалі цябе далоняй, ты ламаўся і калечыў ім усю руку, а калі абапіраліся на цябе,
ты ламаўся і хісталіся сьцёгны іхнія.
8 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я прывяду на цябе меч і вынішчу з цябе чалавека
і быдла.
9 І станецца зямля Эгіпецкая пусткай і руінаю, і даведаюцца яны, што Я — ГОСПАД, за тое, што
ты сказаў: ”Мая рака, я яе зрабіў”.
10 Дзеля гэтага, вось, Я супраць цябе і супраць рэкаў тваіх, і Я аддам зямлю Эгіпецкую
пустошыць пусташэньнем, і яна [будзе] пусткаю ад Мігдолу аж да Сэвэны і аж да межаў Кушу.
11 Ня пройдзе па ёй нага чалавека, і нага быдла ня пройдзе праз яе, і ня будзе яна абжытая
сорак гадоў.
12 І Я зраблю зямлю Эгіпецкую пусткаю паміж земляў спустошаных; а гарады ейныя будуць
сярод гарадоў зруйнаваных, пусткаю сорак гадоў, і Я расьцярушу Эгіпцянаў паміж народамі,
і раскідаю іх сярод земляў.

13 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Калі скончацца тыя сорак гадоў, Я зьбяру Эгіпцянаў спаміж
народаў, сярод якіх Я расьцярушыў іх,
14 і адмяню долю Эгіпту, і зьбяру іх у зямлі Патрос, у зямлі паходжаньня іхняга, і будуць яны
там валадарствам слабым.
15 Сярод валадарстваў будзе яно слабое, і ніколі не падымецца над народамі. Я зьменшу іх,
каб не панавалі над народамі.
16 Ня будзе больш яно надзеяй для дому Ізраіля, і яно будзе ім нагадваць беззаконьні [іхнія],
калі яны зьвярталіся да яго, і даведаюцца, што Я — Госпад ГОСПАД”».
17 І сталася ў дваццаць сёмым годзе, у першым [месяцы], у першы [дзень] месяца, і было слова
ГОСПАДА да мяне, кажучы:
18 «Сыне чалавечы, Навухаданосар, валадар Бабілонскі, даў войску свайму працу супраць
Тыру; кожная галава палысела і кожнае плячо агалела, але ані ён, ані войска ягонае не
атрымалі ад Тыру ўзнагароды за працу, якую выканалі супраць яго.
19 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я даю Навухаданосару, валадару Бабілонскаму,
зямлю Эгіпецкую, і ён забярэ багацьці ейныя, захопіць здабычу ейную і возьме яе сабе, і гэта
будзе платай войску ягонаму.
20 Як плату за выкананую там працу Я даю яму зямлю Эгіпецкую, бо для Мяне яны працавалі,
кажа Госпад ГОСПАД.
21 У той дзень Я вырашчу рог дому Ізраіля, і табе адчыню вусны твае сярод іх, і даведаюцца,
што Я — ГОСПАД”».

Эзк 30

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, прароч і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Галасіце дзеля таго дня!
3 Бо блізкі дзень, блізкі дзень ГОСПАДА! Днём хмараў будзе час [кары] для народаў.
4 І прыйдзе меч на Эгіпет, і будзе страх у Кушы, калі будуць падаць забітыя ў Эгіпце, калі
забяруць мноства ягонае, калі будуць зруйнаваныя падмуркі ягоныя.
5 Куш, Пут і Люд, і ўсе чужынцы, і Куб, і сыны зямлі запавету [разам] з імі пагінуць ад мяча.
6 Гэта кажа ГОСПАД. Упадуць падпоры Эгіпту і ўпадзе пыхлівасць магутнасьці ягонай, ад
Мігдолу аж да Сэвэны будуць падаць ад мяча, кажа Госпад ГОСПАД.
7 І будзе ён спусташэньнем сярод земляў спустошаных, і гарады ягоныя будуць між гарадоў
зруйнаваных.
8 І яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі Я прывяду агонь пад Эгіпет і будуць патрушчаны
ўсе, хто дапамагае яму.
9 У той дзень выйдуць ад аблічча Майго пасланцы на караблях, каб патрывожыць спакой Кушу,
і трывога падымецца сярод іх у дзень Эгіпту, бо вось, ён надыходзіць.
10 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Я зраблю канец мноству Эгіпта рукою Навухаданосара, валадара
Бабілону.
11 Ён і народ ягоны, магутныя між народаў, прыйдуць, каб нішчыць зямлю гэтую. Яны
выцягнуць мячы свае супраць Эгіпту і напоўняць зямлю забітымі.
12 І Я зраблю рэкі сухадолам, і аддам зямлю ў рукі ліхотнікаў, і спустошу зямлю і ўсё, што ў
ёй, рукою чужынцаў. Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта]”.
13 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Я зьнішчу ідалаў і зраблю канец балванам з Нофу, і ня будзе
больш князя ў зямлі Эгіпецкай. І Я спашлю страх на зямлю Эгіпецкую.
14 І Я спустошу Патрос, і пушчу агонь на Цаан, і ўчыню суд у Но.
15 І Я выльлю гнеў Мой на Сін, крэпасьць Эгіпецкую, і вынішчу шматлюдзтва ў Но.
16 І Я спашлю агонь на Эгіпет; будзе качацца ад болю Сін, і Но будзе здабыты, а на Ноф
[прыйдуць] ворагі ўдзень.
17 Юнакі з Авэну і Пі-Бэсэту будуць падаць ад мяча, а [гарады] гэтыя пойдуць у няволю.
18 У Тахпанхэсе сьцямнее дзень, калі Я зламлю там ярмо Эгіпецкае. І скончыцца ў ім
пыхлівасьць магутнасьці ягонай. Хмара закрые яго, і дочкі ягоныя пойдуць у няволю.

19 І Я ўчыню суды [Мае] ў Эгіпце, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД”».
20 І сталася ў адзінаццатым годзе, у першым [месяцы], у сёмы [дзень] месяца, і было слова
ГОСПАДА да мяне, кажучы:
21 «Сыне чалавечы, Я зламаў рамяно фараона, валадара Эгіпту, і вось, яно ня будзе
перавязанае, каб даць лекі, каб зрабіць павязку, каб перавязаць яго, каб ня меў ён сіл трымаць
меч.
22 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я супраць фараона, валадара Эгіпецкага, і Я
зламлю рамёны ягоныя, тое моцнае і тое зламанае, і выкіну меч з рукі ягонай.
23 І Я расьцярушу Эгіпцянаў сярод народаў, і раскідаю іх паміж земляў.
24 І Я ўмацую рамёны валадара Бабілонскага, і дам меч Мой у руку ягоную; і Я зламлю рамёны
фараона, і ён будзе стагнаць, як стогне паранены, перад абліччам ягоным.
25 І Я ўмацую рамёны валадара Бабілонскага, а рамёны фараона аслаблю, і даведаюцца, што
Я — ГОСПАД, калі дам меч Мой у руку валадара Бабілонскага і ён выцягне яго супраць зямлі
Эгіпецкай.
26 І Я расьцярушу Эгіпцянаў сярод народаў, і раскідаю іх паміж земляў, і яны даведаюцца, што
Я — ГОСПАД”».

Эзк 31

1 І сталася ў адзінаццатым годзе, у трэцім [месяцы], у першы [дзень] месяца, і было слова
ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, скажы фараону, валадару Эгіпецкаму, і ўсяму мноству ягонаму: “Да каго
падобным стаўся ты ў вялікасьці тваёй?
3 Вось, Ашур, кедр на Лібане, з прыгожымі галінамі і цяністаю лістотаю, гонкі высокасьцю, і
паміж хмарамі вершаліна ягоная.
4 Воды вырасьцілі яго, бяздоньне ўзьняло яго, рэкі свае ён скіраваў кругом каранёў сваіх і
струмяні свае накіраваў да ўсіх дрэваў палявых.
5 Таму вышынёй ён стаў вышэйшы за ўсе дрэвы палявыя, і памножыліся галіны ягоныя, і
паднялося гальлё ягонае дзеля мноства вады.
6 У галінах ягоных парабілі гнёзды ўсе птушкі нябесныя; а пад гальлём ягоным нараджаліся
ўсе зьвяры палявыя, і ў ценю ягоным жылі ўсе народы шматлікія.
7 І быў ён прыгожы ў вялікасьці сваёй і ў рассахатасьці галінаў сваіх, бо карані ягоныя былі
блізка водаў вялікіх.
8 Кедры ў садзе Божым не былі роўныя яму, кіпарысы не маглі параўнацца з галінамі
ягонымі, явары не маглі зраўняцца з зелянінай ягонай, ніводнае дрэва ў садзе Божым не было
падобным да яго прыгажосьцю сваёю.
9 Я аздобіў яго мноствам галінаў, і зайздросьцілі яму ўсе дрэвы Эдэму, якія ў садзе Божым.
10 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што ён так высока вырас, і вершаліну сваю
падняў аж да хмараў, і сэрца ягонае вывышалася з прычыны вялікасьці ягонай,
11 Я аддам яго ў рукі моцнага сярод народаў, каб, учыняючы, учыніў яму адпаведна
нягоднасьці ягонай, і Я выгнаў яго.
12 І зрэзалі яго чужынцы, найгоршыя з народаў, і кінулі яго. На горы і на ўсе даліны пападалі
галіны ягоныя, і гальлё ягонае паламанае [патанула] ў-ва ўсіх струмянях зямлі. І з-пад ценю
ягонага выйшлі ўсе народы зямлі, і пакінулі яго.
13 На руінах ягоных жывуць птушкі нябесныя, а між галінамі ягонымі — усе зьвяры палявыя,
14 каб не вывышалася ў высокасьці сваёй ніводнае дрэва [над] водамі і не падымала вершаліны
сваёй паміж хмарамі, і каб тыя, што напоеныя вадою, не станавіліся магутнымі ў вялікасьці
сваёй. Бо ўсе яны аддадзеныя сьмерці, пойдуць у краіну падземную да тых сыноў чалавечых,
якія зыходзяць у магілу”.
15 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “У дзень, калі ён зыйшоў у адхлань, Я ўчыніў жалобу, зачыніў
над ім бездань, затрымаў рэкі ягоныя і спыніў воды вялікія; дзеля яго Я зацемніў Лібан, і ўсе
дрэвы палявыя сохлі дзеля яго.

16 Грукатам падзеньня ягонага Я ўстрывожыў народы, калі завёў яго ў адхлань да тых, што
зыходзяць у магілу. І ўсьцешыліся ў краіне падземнай усе дрэвы Эдэму, прыгожыя і добрыя
[дрэвы] Лібану, усе, якія напоены водамі.
17 Таксама яны зыйшлі з ім у адхлань да забітых мячом і паплечнікаў ягоных, што сядзелі ў
ценю ягоным сярод народаў.
18 Да якога дрэва Эдэму ты падобны ў славе і велічы? І ты кінуты разам з дрэвамі Эдэму
ў краіну падземную; сярод неабрэзаных ляжыш, сярод забітых мячом". Гэта фараон і ўсё
мноства ягонае, кажа Госпад ГОСПАД».

Эзк 32

1 І сталася ў дванаццатым годзе, у дванаццатым месяцы, у першы [дзень] месяца, і было слова
ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, узьнімі лямант над фараонам, валадаром Эгіпецкім, і скажы яму:
"Львянятка народаў, ты прапаў, а быў ты як цмок у моры, пырхаў у рэках тваіх, муціў ваду
лапамі тваімі і ўзбураў хвалі ягоныя".
3 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Я расьцягну над табою сетку Маю на сходзе народаў шматлікіх, і
яны выцягнуць цябе сеткаю Маёй.
4 І Я кіну цябе на зямлю, і выкіну цябе на аблічча палёў, і дам абжыцца на табе ўсім птушкам
нябесным, і накармлю табою зьвяроў усёй зямлі.
5 І раскідаю па гарах цела тваё, і напоўню даліны падлінай тваёй.
6 І напаю зямлю крывёю тваёй аж па горы, і напоўняцца табою яры.
7 Калі будзеш чэзнуць, Я закрыю неба і зацямню зоркі, сонца закрыю хмарамі, а месяц ня
дасьць бляску свайго.
8 Усе сьвяцілы, якія сьвецяць на небе, Я зацямню дзеля цябе і спашлю цемру на зямлю тваю,
кажа Госпад ГОСПАД.
9 І Я занепакою сэрца народаў шматлікіх, калі прынясу [вестку] пра зьнішчэньне тваё да
народаў зямлі, якіх ты ня ведаеш.
10 І Я ўстрывожу дзеля цябе народы шматлікія, і валадары іхнія спалохаюцца дзеля цябе, калі
буду махаць мячом Маім перад абліччам іхнім, і будуць безупынна дрыжэць у страху за душу
сваю ў дзень падзеньня твайго.
11 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД. Меч валадара Бабілонскага прыйдзе на цябе.
12 Я разаб'ю мячамі волатаў мноства тваё, яны ўсе — найгоршыя з народаў. І яны зьнішчаць
пыху Эгіпту, і будзе выгубленае ўсё мноства ягонае.
13 І Я зьнішчу ўсё быдла ягонае пры водах вялікіх, і больш ня будзе каламуціць іх нага чалавека,
і капыт жывёлы ня будзе каламуціць іх.
14 Тады Я ачышчу воды іхнія, і рэкі іхнія як алей пацякуць, кажа Госпад ГОСПАД.
15 Калі Я перамяню зямлю Эгіпецкую ў пустку, і спустошаная будзе зямля ад таго, што ў ёй,
калі выб'ю ўсіх жыхароў ейных, тады даведаюцца, што Я — ГОСПАД".
16 Гэта лямант, і будуць лямантаваць дочкі народаў, і будуць плакаць дзеля Эгіпту, і дзеля
ўсяго мноства ягонага будуць лямантаваць, кажа Госпад ГОСПАД».
17 І сталася ў дванаццатым годзе, у пятнаццаты [дзень] месяца, і было слова ГОСПАДА да мяне,
кажучы:
18 «Сыне чалавечы, бядуй дзеля мноства Эгіпту і скінь яго, яго і дочак народаў магутных, у
краіну падземную, да тых, якія зыйшлі ў магілу.
19 За каго ты стаў прыгажэйшы? Зыйдзі і ляж сярод неабрэзаных.
20 Яны пападаюць сярод забітых мячом. Меч дадзены, цягніце [Эгіпет] і ўсе народы ягоныя.
21 Прамовяць да яго з сярэдзіны адхлані волаты магутныя разам з паплечнікамі [сваімі]:
"Зыйшлі [ў магілу], ляжаць неабрэзаныя, забітыя мячом!"
22 Там Ашур і ўсе дружыны ягоныя, кругом яго — труны ягоныя, гэта ўсё забітыя, што паляглі
ад мяча.

23 Труны іхнія ў найглыбейшай магіле, і дружыны ягоныя вакол труны ягонай, усе яны
пазабіваныя, паляглі ад мяча тыя, якія палохалі зямлю жывых.
24 Там Элям і ўсё мноства яго вакол труны ягонай, гэта ўсё пазабіваныя, якія паляглі ад мяча,
якія зыйшлі неабрэзаныя ў краіну падземную, гэта тыя, што сеялі страх у зямлі жывых. Ганьбу
яны сваю нясуць разам з тымі, што зыйшлі ў магілу.
25 Сярод забітых далі ложак яму, і ўсё мноства ягонае вакол труны ягонай, усе яны
неабрэзаныя, забітыя мячом; яны сеялі страх у зямлі жывых і панесьлі ганьбу сваю з тымі,
што зыходзяць у магілу; сярод забітых ён паложаны.
26 Там Мэшэк, Туваль і ўсё мноства іхняе вакол трунаў іхніх, усе яны неабрэзаныя, забітыя
мячом, бо яны сеялі страх у зямлі жывых.
27 Ляжаць яны не пры волатах, якія пападалі з неабрэзанымі, якія ў поўнай зброі баявой
зыйшлі ў адхлань, якім палажылі мячы іхнія пад галовы, і беззаконьні іхнія — на костках іхніх,
бо былі яны страхам для волатаў у зямлі жывых.
28 І ты будзеш кінуты сярод неабрэзаных, і будзеш ляжаць сярод тых, якія забітыя мячом.
29 Там Эдом і валадары ягоныя, і ўсе князі ягоныя, якія пры ўсёй сіле сваёй паложаны сярод
тых, якія забітыя мячом. Яны ляжаць сярод неабрэзаных, сярод тых, што зыйшлі ў магілу.
30 Там валадары поўначы, усе яны і ўсе Сідонцы, якія зыйшлі разам з забітымі, асаромленыя,
хоць сеялі страх моцай сваёй. І ляжаць яны, неабрэзаныя, з тымі, якія забітыя мячом, і нясуць
ганьбу сваю разам з тымі, што зыйшлі ў магілу.
31 Убачыць іх фараон і ўсьцешыцца з усім мноствам сваім. Забітыя мячом фараон і ўсё войска
ягонае, кажа Госпад ГОСПАД.
32 Страх сеяў ён у зямлі жывых, таму кінуць яго, каб ляжаў сярод неабрэзаных, з тымі, якія
забітыя мячом, фараон і ўсё мноства ягонае, кажа Госпад ГОСПАД».

Эзк 33

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, прамоў да сыноў народу твайго і скажы ім: “Калі на нейкую зямлю
Я прыводжу меч, і возьме народ зямлі нейкага чалавека спасярод сябе, і паставіць яго
вартаўніком,
3 і ён убачыць, што меч гэты прыходзіць на зямлю, і ён затрубіць у рог, і папярэдзіць народ,
4 але нехта пачуе гук рогу, і ня будзе сьцерагчыся, і прыйдзе меч, і заб’е яго, кроў ягоная будзе
на галаве ягонай.
5 Гук рогу ён пачуў, але не засьцярогся; кроў ягоная будзе на ім самім. А той, хто засьцярогся,
захаваў душу сваю.
6 А калі вартаўнік бачыць, што прыходзіць меч, і не трубіць у рог, і народ не папярэджаны, і
прыходзіць меч, і забівае некага з іх, хоць гэты [забіты] забраны за беззаконьне сваё, але кроў
ягоную Я буду шукаць на руках вартаўніка”.
7 І цябе, сыне чалавечы, Я паставіў вартаўніком для дому Ізраіля, і ты пачуеш з вуснаў Маіх
слова, і папярэдзіш іх ад Мяне.
8 Калі Я скажу бязбожніку: “Бязбожнік, ты, сьмерцю памрэш”, — а ты ня будзеш гаварыць, каб
папярэдзіць бязбожніка пра шлях ягоны, бязбожнік гэты памрэ за беззаконьне сваё, але кроў
ягоную Я буду шукаць на руках тваіх.
9 А калі ты папярэджваў бязбожніка пра шлях ягоны, каб ён зыйшоў з яго, але ён не зыйшоў
са шляху свайго, ён памрэ за беззаконьне сваё, але ты захаваў душу тваю.
10 І ты, сыне чалавечы, кажы дому Ізраіля: “Вы, кажучы, кажаце: "Правіны нашыя і грахі
нашыя [ляжаць] на нас, і мы гінем дзеля іх. Дык як можам жыць?""
11 Скажы ім: “Як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, не хачу сьмерці бязбожніка, але каб адвярнуўся
бязбожнік ад шляху свайго [ліхога] і жыў. Навярніцеся, адвярніцеся ад шляхоў сваіх ліхіх.
Навошта маеце паміраць, дом Ізраіля?”
12 І ты, сыне чалавечы, скажы сынам народу твайго: “Праведнасьць праведніка не ўратуе
яго ў дзень правіны ягонай, і бязбожнік не спатыкнецца аб бязбожнасьць ў дзень, калі ён

адвернецца ад бязбожнасьці сваёй, і праведнік ня зможа жыць у [праведнасьці сваёй] у дзень
грэху свайго”.
13 Калі Я скажу праведніку: “Жывучы, будзеш жыць!”, і ён паспадзяецца на праведнасьць
сваю, і ўчыніць злачынства, уся праведнасьць праведнасьці ягонай ня будзе ўзгадана, і за
злачынства сваё, якое ён учыніў, ён памрэ.
14 А калі я скажу бязбожніку: “Сьмерцю памрэш!”, і ён адвернецца ад грэху свайго, і будзе
чыніць суд і праведнасьць,
15 аддасьць заклад несправядлівы, зьверне тое, што зрабаваў, будзе хадзіць паводле
пастановаў жыцьця, каб не рабіць злачынства, ён, жывучы, будзе жыць і не памрэ.
16 Усе грахі ягоныя, якімі ён саграшыў, ня будуць узгаданыя яму. Ён чыніў суд і праведнасьць,
дык жывучы, будзе жыць.
17 Кажуць сыны народу твайго: “Несправядлівы шлях Госпада”, але іх уласны шлях
несправядлівы.
18 Калі праведнік адвернецца ад праведнасьці сваёй і будзе чыніць злачынства, ён памрэ ў ім.
19 І калі бязбожнік адвернецца ад бязбожнасьці сваёй і будзе чыніць суд і праведнасьць,
дзякуючы ім ён будзе жыць.
20 А вы кажаце: “Несправядлівы шлях Госпада”. Кожнага з вас, дом Ізраіля, Я буду судзіць
паводле шляхоў ягоных».
21 І сталася ў дванаццатым годзе, у дзясятым [месяцы], у пяты [дзень] месяца пасьля
выгнаньня нашага, і прыйшоў да мяне ўцякач з Ерусаліму, кажучы: «Захоплены горад!»
22 І была на мне рука ГОСПАДА ўвечары перад прыйсьцем уцекача, і Ён адчыніў вусны мае,
калі той прыйшоў да мяне раніцаю. І адчыніліся вусны мае, і ня быў я ўжо нямы.
23 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
24 «Сыне чалавечы, жыхары руінаў гэтых у зямлі Ізраіля кажуць, кажучы: “Абрагам быў адзін,
і ўспадкаеміў зямлю гэтую, а нас шмат, нам дадзена зямля гэтая ў спадчыну”.
25 Дзеля гэтага скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вы ясьцё з крывёй, і ўзьнімаеце вочы
вашыя на ідалаў вашых, і разьліваеце кроў, і вы хочаце ўспадкаеміць зямлю?
26 Вы абапіраецеся на меч ваш, учыняеце брыдоты, кожны з вас паганіць жонку бліжняга
свайго, і вы хочаце ўспадкаеміць зямлю?”
27 Гэта скажаш ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Як жывы Я, тыя, што ў руінах, упадуць ад мяча,
а тых, што на абліччы поля, Я аддам зьвярам, каб пажэрлі іх, а тыя, што ў цьвярдынях і ў
пячорах, памруць ад заразы.
28 І Я аддам зямлю гэтую на спусташэньне і разрабаваньне, і скончыцца пыхлівасьць
магутнасьці ейнай, і горы Ізраіля будуць спустошаныя; і ніхто ня будзе хадзіць [там].
29 І даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі Я аддам зямлю гэтую на спусташэньне і разрабаваньне
за ўсе брыдоты іхнія, якія яны ўчынілі”.
30 Сыне чалавечы, сыны народу твайго гавораць пра цябе пры мурах і брамах дамоў сваіх і
гавораць адзін да другога, кожны да брата свайго, кажучы: “Хадзіце, калі ласка, і паслухайце,
якое слова, што выходзіць ад ГОСПАДА”.
31 І прыходзяць да цябе, як на сход народу, і сядзіць перад абліччам тваім народ Мой, і
слухаюць яны словы твае; але іх не выконваюць, бо тое, што прыемнае ў вуснах іхніх, яны
робяць, а сэрца іхняе ідзе за хцівасьцю іхняй.
32 І вось, ты для іх, як [той, які] сьпявае пра каханьне, [мае] прыгожы голас і добра грае, і яны
слухаюць словы твае, але не выконваюць іх.
33 Але калі прыйдзе гэта, і вось, яно прыходзіць, і яны даведаюцца, што прарок быў сярод іх».

Эзк 34

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, прароч супраць пастыраў Ізраіля, прароч і кажы пастырам: “Гэта кажа
Госпад ГОСПАД. Гора пастырам Ізраіля, якія пасьвяць самі сябе! Ці ж пастыры не павінны
пасьвіць авечак?

3 Вы малако спажываеце, у воўну апранаецеся, тлустае забіваеце, але авечак не пасьвіце.
4 Вы саслабелых не ўмацоўвалі, хворай не лекавалі; скалечанай не перавязвалі, заблукалай не вярталі назад, згубленай не шукалі, а абыходзіліся з імі з гвалтам і з прымусам.
5 І расьцярушыліся [авечкі], бо ня мелі пастыра, і сталіся здабычаю ўсіх зьвяроў палявых, і разьбегліся.
6 Блукаюць авечкі Мае на ўсіх гарах і на кожным высокім узгорку, і па ўсім абліччы зямлі разьбегліся авечкі Мае, але ніхто не клапоціцца пра іх і ніхто не шукае іх.
7 Дзеля гэтага, пастыры, слухайце слова ГОСПАДА.
8 Як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што авечкі Мае сталіся здабычай і авечкі Мае сталіся спажывай для ўсіх зьвяроў палявых, бо ня мелі пастыра, бо пастыры Мае не шукалі авечак Маіх, але пасьвілі пастыры саміх сябе, а авечак Маіх ня пасьвілі,
9 дзеля гэтага, пастыры, слухайце слова ГОСПАДА.
10 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць пастыраў. І Я буду шукаць авечак Маіх з рук іхніх, і Я прыбяру іх, каб ня пасьвілі авечак, і ня будуць больш тыя пастыры пасьвіць саміх сябе; і Я вырву авечак Маіх з вуснаў іхніх, і ня будуць яны больш ім на спажываньне.
11 Бо гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я Сам буду шукаць авечак Маіх і буду даглядаць іх.
12 Як аглядае пастух статак свой удзень, калі знаходзіцца сярод расьцярушаных авечак сваіх, так Я буду аглядаць авечак Маіх і вызвалю іх з усіх месцаў, у якія яны былі расьцярушаныя ў дзень хмары і імглы.
13 І Я выведу іх з народаў, і зьбяру іх з земляў, і вярну іх у зямлю іхнюю, і буду пасьвіць іх на гарах Ізраіля, пры ручаях і ў-ва ўсіх паселішчах зямлі.
14 Буду пасьвіць іх на пашах добрых, пашы іхнія будуць на высокіх гарах Ізраіля; там будуць адпачываць на пашах добрых, і на пашах сакавітых будуць пасьвіцца на гарах Ізраіля.
15 Я буду пасьвіць авечак Маіх і дам супачынак ім, кажа Госпад ГОСПАД.
16 Згубленую знайду, заблукалую прывяду, скалечаную перавяжу, хворую ўмацую, а тлустую і дужую зьнішчу. Буду пасьвіць іх паводле суду [справядлівага]”.
17 А вам, авечкі Мае, гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Вось, Я буду судзіць паміж авечкай і авечкай, паміж баранамі і казламі.
18 Ці ж мала вам, што вы пасьвіцеся на пашы добрай? Чаму рэшту пашы вашай вы топчаце нагамі вашымі? І вы п’іцё ваду чыстую, а астатнюю каламуціце нагамі вашымі?
19 І авечкі Мае пасьвяцца на тых [месцах], якія вы стапталі нагамі вашымі, і п’юць тое, што вы скаламуцілі нагамі вашымі”.
20 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД да іх: “Вось, Я Сам буду судзіць паміж авечкай тлустай і авечкай худою.
21 За тое, што вы ўсіх слабых адпіхвалі бакамі і плячыма і папіхалі іх рагамі вашымі, аж пакуль не павыганялі іх прэч,
22 Я дапамагу авечкам Маім, і яны больш ня будуць здабычай, і буду судзіць паміж авечкай і авечкай.
23 І Я пастаўлю для іх аднаго пастыра, слугу Майго Давіда, і ён будзе пасьвіць іх. Ён будзе пасьвіць іх, і ён будзе для іх пастырам.
24 А Я, ГОСПАД, буду для іх Богам, а слуга Мой Давід будзе князем сярод іх. Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта].
25 І Я заключу з імі запавет супакою, і прыбяру зьвяроў ліхіх з зямлі гэтай, і яны будуць жыць у пустыні бясьпечна, і будуць спаць у лясах.
26 І Я дам ім і ваколіцам узвышша Майго дабраславенства, і буду спасылаць дождж у свой час, гэта будзе дождж дабраславенства.
27 І дасьць дрэва палявое плод свой, і зямля дасьць ураджай свой. І яны будуць жыць у бясьпецы ў зямлі сваёй, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД, калі скрышу брускі ярма іхняга і вырву іх з рукі тых, якія зьняволілі іх.
28 І ня будуць яны больш здабычай для народаў, і зьвяры зямныя ня будуць жэрці іх, але яны будуць жыць у бясьпецы, і [ніхто] ня будзе іх пужаць.

29 І Я пастаўлю ім парасьць для славы, і ня будуць яны больш гінуць з голаду на зямлі, і ня
будуць больш зносіць зьнявагі народаў.
30 І даведаюцца, што Я — ГОСПАД, Бог іхні, з імі, а яны — народ Мой, дом Ізраіля, кажа Госпад
ГОСПАД.
31 Вы — авечкі Мае, авечкі пашы Маёй, вы — людзі, а Я — Бог ваш, кажа Госпад ГОСПАД”».

Эзк 35

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сын чалавечы, зьвярні аблічча тваё супраць гары Сэір і прароч супраць яе.
3 І скажаш ёй: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць цябе, гара Сэір, і Я выцягну руку
Маю супраць цябе, і аддам цябе на спусташэньне і разрабаваньне.
4 Гарады твае Я зраблю руінамі, і ты станешся пусткаю, і даведаешся, што Я — ГОСПАД.
5 За тое, што меў ты вечную варожасьць і аддаў сыноў Ізраіля пад меч у час загубы іхняй,
падчас беззаконьня канца [іхняга],
6 дзеля гэтага, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, Я перамяню цябе ў кроў, і кроў будзе
перасьледаваць цябе. Бо ты крыві не зьненавідзеў, таму кроў будзе перасьледаваць цябе.
7 Гару Сэір Я аддам на спусташэньне і разрабаваньне, і вынішчу на ёй таго, хто ідзе, і таго, хто
вяртаецца.
8 І Я напоўню забітымі горы твае, і на ўзвышшах тваіх, і ў лагчынах тваіх, і ў-ва ўсіх ярах тваіх
будуць падаць пазабіваныя мячом.
9 Я зраблю цябе вечнай пусткаю, гарады твае ня будуць абжытыя, і даведаецеся, што Я —
ГОСПАД.
10 За тое, што ты сказаў: "Абодва народы і абедзьве зямлі будуць мае, я вазьму іх у спадчыну,
хоць там быў ГОСПАД",
11 дзеля гэтага, як жывы Я, кажа Госпад ГОСПАД, Я зраблю табе паводле гневу твайго і паводле
зайздрасьці тваёй, якую выказаў ты, маючы нянавісьць да іх. І Я стануся вядомым для іх, калі
буду судзіць цябе.
12 І ты даведаешся, што Я — ГОСПАД, Я чуў усе зьнявагі твае, якія ты казаў супраць гор Ізраіля,
кажучы: "Яны спусташэньнем спустошаныя, аддадзеныя нам на ежу".
13 Вы вывышаліся адносна Мяне вуснамі сваімі, і памнажалі супраць Мяне словы вашыя, Я чуў
[гэта].
14 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: "Як узрадуецца ўся зямля, калі Я зраблю цябе пусткаю.
15 І як ты радаваўся, што спадчына дому Ізраіля спустошаная, гэтак сама Я зраблю табе.
Пусткаю станецца гара Сэір і ўвесь Эдом, усе вы; і даведаецеся, што Я — ГОСПАД"”.

Эзк 36

1 А ты, сын чалавечы, прароч пра горы Ізраіля і кажы: “Горы Ізраіля, слухайце слова ГОСПАДА.
2 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што вораг казаў пра вас: "Ага, узгоркі адвечныя дадзены
нам на ўласнасьць",
3 дзеля гэтага прароч і скажы: "Гэта кажа Госпад ГОСПАД. За тое, што пустошылі і тапталі вас
адусюль навокал, каб вы сталіся ўласнасьцю рэшты народаў і былі ўзятыя на кончык языка і
на прыказку ў народзе,
4 дзеля гэтага, горы Ізраіля, слухайце слова Госпада ГОСПАДА. Гэта кажа Госпад ГОСПАД
гарам і ўзгоркам, ярам і лагчынам, руінам спустошаным і гарадам бязьлюдным, якія сталіся
здабычай і насьмешкай рэшты народаў, якія навокал.
5 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Сапраўды, у агні рэўнасьці Маёй Я прамовіў супраць рэшты
народаў і супраць усяго Эдому, якія ўзялі зямлю Маю на ўласнасьць з радасьцю ўсяго сэрца
і з пагардаю ў душы, каб гнаць яе як здабычу"”.
6 Дзеля гэтага прароч пра зямлю Ізраіля і скажы да гор і ўзгоркаў, яроў і лагчынаў: “Гэта
кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я прамовіў з рэўнасьцю Маёй і з абурэньнем Маім, бо вы зносіце
зьнявагу [з боку] народаў”.

7 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Я ўзьнімаю руку Маю [з прысягаю], што народы, якія
вакол вас, панясуць зьнявагу сваю.
8 А вы, горы Ізраіля, пусьціце галіны вашыя і будзеце даваць плады вашыя народу Майму
Ізраілю, бо яны наблізіліся, каб прыйсьці [да вас].
9 Бо вось, Я [прыйду] да вас і зьвярнуся да вас, і будуць вас абрабляць і засяваць.
10 І Я памножу на вас людзей, увесь дом Ізраіля, і гарады будуць абжытыя, і руіны будуць
адбудаваныя.
11 І Я памножу на вас людзей і жывёлу, яны будуць шматлікія і плодныя, і Я засялю вас так,
як у часы старадаўнія, і Я буду рабіць вам добрае [больш], чым у [час] пачатку вашага, і вы
даведаецеся, што Я — ГОСПАД.
12 І прывяду зноў на вас людзей, народ Мой Ізраіль, і яны ўспадкаемяць вас, і вы станецеся для
іх спадчынай, і ўжо ня будзеце пазбаўляць іх дзяцей”.
13 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “За тое, што кажуць пра вас: “Ты зьядаеш чалавека і робіш
бязьдзетным народ твой”,
14 дзеля гэтага больш ня будзеш зьядаць чалавека і больш ня зробіш бязьдзетным народ твой,
кажа Госпад ГОСПАД.
15 І ты не пачуеш больш зьнявагаў ад народаў і насьмешак ад плямёнаў, і больш ня будзеш
рабіць бязьдзетным народ твой, кажа Госпад ГОСПАД”».
16 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
17 «Сыне чалавечы, дом Ізраіля жыў на зямлі сваёй, і ён апаганіў яе шляхамі сваімі і ўчынкамі
сваімі. Як нячыстасьць месячная жанчыны быў шлях іхні адносна Мяне.
18 І Я выліў на іх гнеў Мой з прычыны крыві, якую яны вылілі на зямлю, і з прычыны ідалаў
іхніх, якімі яны апаганілі яе.
19 І Я расьцярушыў іх паміж народаў, і яны расьсеяліся па землях. Паводле шляхоў іхніх і
паводле ўчынкаў іхніх Я асудзіў іх.
20 І яны прыйшлі да народаў, і там, куды прыйшлі, яны зьняважылі імя Маё сьвятое, калі казалі
пра іх: “Гэта народ ГОСПАДА, і яны выйшлі з зямлі Ягонай”.
21 І Я пашкадаваў імя Маё сьвятое, якое зьняважыў дом Ізраіля сярод народаў, да якіх яны
прыйшлі.
22 Дзеля гэтага скажы дому Ізраіля: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ня дзеля вас Я раблю гэта, доме
Ізраіля, але дзеля імя Майго сьвятога, якое вы зьняважылі сярод народаў, да якіх вы прыйшлі.
23 І Я зраблю сьвятым імя Маё вялікае, зьняважанае сярод народаў, якое вы зьняважылі сярод
іх, і даведаюцца народы, што Я — ГОСПАД, кажа Госпад ГОСПАД, калі Я выяўлю сьвятасьць Маю
сярод вас на вачах іхніх.
24 І Я вазьму вас спасярод народаў, і зьбяру вас з усіх земляў, і прывяду вас у зямлю вашую.
25 І Я пакраплю вас вадою чыстаю, і вы станецеся чыстымі, і ад усякае нячыстасьці вашай і ад
усіх ідалаў вашых Я ачышчу вас.
26 І Я дам вам сэрца новае, і духа новага дам у нутро вашае, і забяру сэрца каменнае з цела
вашага, і дам вам сэрца з цела.
27 І Духа Майго Я дам у нутро вашае, і зраблю, што паводле пастановаў Маіх вы будзеце хадзіць
і суд Мой будзеце захоўваць і выконваць.
28 І вы будзеце жыць у зямлі, якую Я даў бацькам вашым, і будзеце для Мяне народам, а Я буду
для вас Богам.
29 І Я вызвалю вас ад усякай нячыстасьці вашай, і паклічу [да вас] збожжа, і памножу яго, і не
спашлю на вас голад.
30 І Я памножу плод дрэваў і ўраджай поля, каб вы больш ня мелі ганьбы голаду сярод народаў.
31 І вы ўзгадаеце шляхі вашыя ліхія і ўчынкі вашыя, якія не [былі] добрыя, і будзеце брыдзіцца
саміх сябе з прычыны беззаконьняў вашых і брыдотаў вашых.
32 Не дзеля вас Я раблю [гэта], кажа Госпад ГОСПАД, няхай [гэта] будзе вам вядома.
Засаромцеся і пачырванейце з прычыны шляхоў вашых, доме Ізраіля.
33 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. У дзень, калі Я ачышчу вас ад усіх беззаконьняў вашых, Я засялю
гарады гэтыя, і будуць адбудаваныя руіны,

34 і зямля спустошаная будзе абрабляная, замест таго, каб быць пустэчаю ў вачах кожнага, хто праходзіць.
35 І скажуць: "Гэтая зямля спустошаная сталася, як сад Эдэм, а гэтыя гарады, зьнішчаныя, спустошаныя і зруйнаваныя [сталіся] умацаваныя і населеныя".
36 І даведаюцца народы, якія засталіся вакол вас, што Я, ГОСПАД, адбудаваў зруйнаванае і засадзіў спустошанае. Я, ГОСПАД, прамовіў [гэта] і зрабіў.
37 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Яшчэ ў гэтым Я буду прыхільным да дому Ізраіля, каб зрабіць ім тое, што Я памножу ў іх людзей як авечак.
38 Як авечкі пасьвячоныя, як авечкі Ерусаліму ў [дні] сьвятаў ягоных, так гарады спустошаныя станацца поўныя лю-дзей як авечак, і даведаюцца, што Я — ГОСПАД”».

Эзк 37

1 Была на мне рука ГОСПАДА, і Ён вывеў мяне ў Духу ГОСПАДА, і паставіў мяне сярод даліны, і яна [была] поўная костак.
2 І Ён абвёў мяне вакол іх, і вось, іх вельмі шмат на абліччы той даліны, і вось, яны вельмі сухія.
3 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, ці ажывуць косткі гэтыя?» А я сказаў: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ, Ты ведаеш».
4 І Ён сказаў мне: «Прароч пра косткі гэтыя і скажы ім: “Косткі сухія, слухайце слова ГОСПАДА!
5 Гэта кажа Госпад ГОСПАД косткам гэтым. Вось, Я ўвяду ў вас дух, і будзеце жыць,
6 і Я зьвяжу вас жыламі, і вырашчу на вас цела, і абцягну вас скураю, і дам вам духа, і будзеце жыць, і даведаецеся, што Я — ГОСПАД”».
7 І я прарочыў, як мне было загадана. І стаўся шум, калі я прарочыў. І вось, грукат, і наблізіліся косткі, костка да косткі сваёй.
8 І я ўбачыў, і вось, на костках жылы, і вырасла цела, і была пазьней нацягнута на іх скура, але духа не было ў іх.
9 І Ён сказаў мне: «Прароч да духа, прароч, сыне чалавечы, і скажы духу: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ад чатырох вятроў прыйдзі дух, і дыхні на гэтых забітых, і яны будуць жыць”».
10 І я прарочыў, як Ён загадаў мне. І ўвайшоў у іх дух, і яны ажылі, і сталі на ногі свае, войска вельмі-вельмі вялікае.
11 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, косткі гэтыя — [гэта] ўвесь дом Ізраіля. Вось, яны кажуць: “Высахлі косткі нашыя, і загінула надзея нашая, мы сьсечаныя”.
12 Дзеля гэтага прароч і скажы ім: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я адчыню магілы вашыя і выведу вас з магілаў вашых, народзе Мой, і ўвяду вас у зямлю Ізраіля.
13 І вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД, калі Я адчыню магілы вашыя, і выведу вас з магілаў вашых, народзе Мой.
14 І Я дам вам Духа Майго, і вы ажывіцё, і Я завяду вас у зямлю вашую, і вы даведаецеся, што Я — ГОСПАД, Я прамовіў [гэта] і зрабіў, кажа ГОСПАД”».
15 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
16 «А ты, сыне чалавечы, вазьмі сабе [кавалак] дрэва і напішы на ім: “Для Юды і сыноў Ізраіля, таварышаў ягоных”. І вазьмі другі [кавалак] дрэва і напішы на ім: “Для Язэпа і ўсяго дому Ізраіля, таварышаў ягоных”.
17 І злучы іх з сабой, адно з другім, у адзін [кавалак] дрэва, каб былі яны адно ў руцэ тваёй.
18 І калі скажуць табе сыны народу твайго, кажучы: “Ці не паведаміш ты нам, што гэта ў цябе [значыць]?”,
19 прамовіш да іх: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я вазьму дрэва Язэпа, якое ў руцэ Эфраіма, і плямёны Ізраіля, таварышаў ягоных, і прыкладу іх да дрэва Юды, і зраблю іх адным дрэвам, і яны будуць адно ў руцэ Маёй”.
20 І будуць тыя [кавалкі] дрэва, на якіх ты напісаў, у руцэ тваёй перад вачыма іхнімі.
21 І прамовіш да іх: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я вазьму сыноў Ізраіля спасярод народаў, да якіх яны пайшлі, і зьбяру іх адусюль, і ўвяду іх у зямлю іхнюю.

22 І зраблю іх адным народам у зямлі гэтай, на гарах Ізраіля, і адзін валадар будзе валадаром
для ўсіх іх, і больш ня будуць яны двума народамі, і больш ня будуць падзеленыя на два
валадарствы.
23 І ня будуць больш яны паганіцца ідаламі сваімі і брыдотамі сваімі, і ўсякімі злачынствамі
сваімі. І Я збаўлю іх з усіх сялібаў іхніх, у якіх яны грашылі, і ачышчу іх, і яны будуць для Мяне
народам, а Я буду для іх Богам.
24 І слуга Мой, Давід, будзе валадаром над імі, і пастыр адзін будзе для ўсіх іх, і яны будуць
хадзіць паводле судоў Маіх, і пастановы Мае будуць захоўваць, і будуць выконваць іх.
25 І яны будуць жыць на зямлі, якую даў Я слузе Майму Якубу, на якой жылі бацькі іхнія. І
будуць жыць на ёй яны і сыны іхнія, і сыны сыноў іхніх на вякі, і Давід, слуга Мой, [будзе]
князем у іх на вякі.
26 І Я заключу з імі запавет супакою, і будзе гэта запавет вечны з імі. І Я ўмацую іх, і памножу,
і сьвятыня Мая будзе сярод іх на вякі.
27 І будзе сяліба Мая над імі, і Я буду для іх Богам, а яны будуць для Мяне народам.
28 І даведаюцца народы, што Я — ГОСПАД, Які асьвячае Ізраіля, калі сьвятыня Мая будзе сярод
іх на вякі”».

Эзк 38

1 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
2 «Сыне чалавечы, зьвярні аблічча тваё супраць Гога з зямлі Магог, князя Рошу, Мэшэку і
Тувалю, і прароч супраць яго,
3 і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось, Я супраць цябе, Гог, князь Рошу, Мэшэку і Тувалю.
4 І Я завярну цябе, і ўкладу гакі ў сківіцы твае, і выведу цябе і ўсё войска тваё, коней і вершнікаў,
усіх выдатна ўзброеных, збор шматлікі, са шчытамі і тарчамі, усіх узброеных мячамі.
5 Пэрсы, Куш і Пут, усе яны са шчытом і шаломам,
6 Гомэр і ўсе дружыны ягоныя, дом Тагармы з канцоў поўначы і ўсе дружыны іхнія, і мноства
народаў з табою.
7 Падрыхтуйся і будзь гатовы, ты і ўсе зборы твае, якія сабраліся кругом цябе, і ты будзеш з імі
на варце.
8 Праз шмат дзён Я наведаю цябе, пры канцы гадоў ты прыйдзеш у зямлю, якая ацалела ад
мяча, у якой сабраны [народ] спаміж шматлікіх народаў на гарах Ізраіля, што доўга былі
руінаю. І ён будзе выведзены спасярод народаў, і яны ўсе будуць жыць у бясьпецы.
9 І ты ўвойдзеш, як бура, і прыйдзеш, як хмара, каб пакрыць зямлю. Будзеш [там] ты і ўсе
дружыны твае, і шмат народаў з табою.
10 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. І станецца ў той дзень, і ўвойдуць словы ў сэрца тваё, і ты
задумаеш думку ліхую,
11 і скажаш: "Вырушу на зямлю неўмацаваную, пайду на [людзей] спакойных, якія жывуць у
бясьпецы, усе яны ня маюць муроў, засавак і брамаў,
12 каб рабаваць рабаваньнем і браць здабычу, каб руку сваю зьвярнуць супраць руінаў,
якія [зноў] абжытыя, і супраць народу, які сабраны спасярод народаў, які набывае статкі і
маёмасьць, і жыве ў сярэдзіне зямлі".
13 Шэва і Дэдан, і купцы з Таршышу, і ўсе ільвяняты ягоныя скажуць табе: "Ці ты прыйшоў
узяць здабычу? Ці ты сабраў зборышча тваё, каб рабаваць рабаваньнем, каб вынесьці срэбра і
золата, каб узяць для сябе статкі і маёмасьць, каб узяць здабычу вялікую? ""
14 Дзеля гэтага прароч, сыне чалавечы, і скажы Гогу: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ці ж у той
дзень, калі народ Мой Ізраіль будзе жыць у бясьпецы, ты не даведаешся пра гэта?
15 І ты прыйдзеш з месца свайго, з канца поўначы, ты і шмат народаў з табой, усе сядзяць на
конях, зборышча вялікае і войска шматлікае.
16 І ты выйдзеш супраць народу Майго Ізраіля, як хмара, каб пакрыць зямлю. Пры канцы дзён
станецца [гэта], і Я прывяду цябе ў зямлю Маю, каб даведаліся пра Мяне народы, калі Я выяўлю
сьвятасьць Маю на табе, Гог, на вачах іхніх”.

17 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ці ты — той, пра якога ў дні старадаўнія Я гаварыў праз рукі
слугаў Маіх, прарокаў Ізраіля, якія ў тыя дні прадказвалі, што Я прывяду цябе да іх?
18 І станецца ў той дзень, у дзень, калі Гог прыйдзе ў зямлю Ізраіля, кажа Госпад ГОСПАД,
рэўнасьць Мая ўвойдзе ў ноздры Мае.
19 І ў ярасьці Маёй, у полымі гневу Майго Я прамовіў: “Сапраўды, у той дзень станецца
землятрус вялікі ў зямлі Ізраіля.
20 І задрыжаць перад абліччам Маім рыбы марскія і птушкі нябесныя, зьвяры палявыя і ўсё,
што поўзае па зямлі, і ўсе людзі, якія на абліччы зямлі. І будуць зруйнаваныя горы, і заваляцца
стромыя [скалы], і ўсе муры ўпадуць на зямлю.
21 І Я паклічу супраць яго меч на ўсіх гарах, кажа Госпад ГОСПАД, меч кожнага [зьвернецца]
супраць брата.
22 І Я буду судзіць яго заразаю, крывёй і дажджом залеўным, і градам каменным. Агонь і серку
спашлю на яго, і на дружыны ягоныя, і на народы шматлікія, якія з ім.
23 І Я ўзьвялічуся, і выяўлю сьвятасьць, і выяўлю Сябе перад вачыма народаў шматлікіх, і яны
даведаюцца, што Я — ГОСПАД”.

Эзк 39

1 А ты, сыне чалавечы, прароч супраць Гога і кажы: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось Я супраць
цябе, Гог, князь Рошу, Мэшэку і Тувалю.
2 І Я вярну цябе, і прывяду цябе, і прыцягну цябе з канца поўначы, і завяду цябе на горы Ізраіля.
3 І Я выб’ю лук твой з левай рукі тваёй, і выкіну стрэлы твае з правай рукі тваёй.
4 На гарах Ізраіля ўпадзеш ты і ўсе дружыны твае, і народы, якія з табою; драпежным птушкам,
усім крылатым, і зьвярам палявым Я аддам цябе на жыраваньне.
5 І ты ўпадзеш на абліччы поля, бо Я прамовіў [гэта], кажа Госпад ГОСПАД.
6 І Я спашлю агонь на Магога і на тых, якія жывуць у бясьпецы на астравах, і яны даведаюцца,
што Я — ГОСПАД.
7 І імя Маё сьвятое абвяшчу сярод народу Майго Ізраіля, і больш ня дам зьневажаць імя Маё
сьвятое, і даведаюцца народы, што Я — ГОСПАД, Сьвяты Ізраіля”.
8 Вось, прыходзіць і станецца, кажа Госпад ГОСПАД. Гэта той дзень, пра які Я прамовіў.
9 І выйдуць жыхары гарадоў Ізраіля, каб распаліць агонь і спаліць зброю, шчыты і тарчы, лукі
і стрэлы, доўбні і дзіды, сем гадоў будуць паліць гэта ў агні.
10 І ня будуць яны прыносіць дрэвы з поля, і ня будуць сячы ў лясах, бо зброяй будуць
распальваць агонь. І яны абрабуюць тых, якія іх рабавалі, і возьмуць здабычу ў тых, якія ў
іх бралі здабычу, кажа Госпад ГОСПАД.
11 І станецца ў той дзень, Я вызначу Гогу месца, дзе будзе магіла ягоная ў Ізраілі, даліну
Абарым на ўсход ад мора, і адгараджу яе ад тых, што праходзяць, і там пахаваюць Гога і ўсё
войска ягонае, і назавуць яе “Далінай войска Гога”.
12 І будзе хаваць іх дом Ізраіля, каб ачысьціць зямлю, сем месяцаў.
13 І будзе хаваць іх увесь народ зямлі, і будзе для іх слаўны той дзень, калі Я зьяўлю славу Маю,
кажа Госпад ГОСПАД.
14 І будуць вызначаныя людзі, якія без перапынку будуць хадзіць па зямлі і хаваць тых, якія
засталіся на абліччы зямлі, каб ачысьціць яе. Як пройдзе сем месяцаў, будуць яны шукаць.
15 І калі будуць яны хадзіць па зямлі, і ўбачаць костку чалавечую, паставяць каля яе знак, аж
пахаваюць яе грабары ў “Даліне войска Гога”.
16 А назва гораду — Гамона. І ачысьцяць зямлю.
17 А ты, сыне чалавечы, кажа Госпад ГОСПАД, скажы птушкам, усім крылатым, і ўсім зьвярам
палявым: “Зьбірайцеся і прыходзьце; зьбірайцеся з усіх бакоў на ахвяру Маю, якую Я прынясу
для вас, ахвяру вялікую на гарах Ізраіля. Ешце мяса і піце кроў!
18 Цела волатаў будзеце есьці і кроў князёў зямлі будзеце піць, усе яны — бараны, ягняты,
казлы, цяляты тлустыя з Башану.

19 І будзеце есьці тлушч да сытасьці, і кроў будзеце піць да ап’яненьня ад ахвяры Маёй, якую
Я прынёс для вас.
20 І вы насыціцеся пры стале Маім канём і калясьніцаю, волатам і ўсякім ваяром, кажа Госпад
ГОСПАД.
21 І Я зьяўлю славу Маю сярод народаў, і ўбачаць усе народы суд Мой, які Я ўчыню, і руку Маю,
якую на іх пакладу.
22 І даведаецца дом Ізраіля, што Я — ГОСПАД, Бог іхні ад гэтага дня і назаўсёды,
23 І даведаюцца народы, што за беззаконьні свае пайшоў на выгнаньне дом Ізраіля, бо яны
адступіліся ад Мяне, і Я схаваў аблічча Маё ад іх, і аддаў іх у руку прыгнятальнікаў іхніх, і ўсе
яны пападалі ад мяча.
24 Паводле нячыстасьці іхняй і паводле злачынстваў іхніх Я зрабіў з імі, і схаваў аблічча Маё
ад іх”.
25 Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: “Цяпер Я вярну палон Якуба і пашкадую ўвесь дом
Ізраіля, і задбаю пра імя Маё сьвятое.
26 І яны панясуць ганьбу сваю і ўсю нявернасьць сваю, якой яны адступіліся ад Мяне, калі Я
пасялю іх у зямлі іхняй у бясьпецы, і ніхто ня будзе палохаць іх,
27 калі Я выведу іх спасярод народаў і зьбяру іх з земляў ворагаў іхніх, і зьяўлю ў іх сьвятасьць
Маю на вачах народаў шматлікіх.
28 І яны даведаюцца, што Я — ГОСПАД, Бог іхні, калі выганю іх да народаў, і зьбяру іх зноў у
зямлі іхняй, і больш не пакіну там нікога з іх.
29 І больш не схаваю аблічча Майго ад іх, бо выльлю Духа Майго на дом Ізраіля, кажа Госпад
ГОСПАД”».

Эзк 40

1 У дваццаць пятым годзе выгнаньня нашага, на пачатку году, у дзясяты [дзень] месяца, у
чатырнаццатым годзе пасьля таго, як быў зруйнаваны горад, у той самы дзень была на мне
рука ГОСПАДА, і Ён завёў мяне туды.
2 У відзежах Божых Ён завёў мяне ў зямлю Ізраіля і паставіў мяне на гары вельмі высокай, а
на ёй былі нібыта пабудовы гораду, на поўдні.
3 І Ён завёў мяне туды, і вось, чалавек, які меў выгляд, нібы з медзі; і вяроўка ільняная ў руцэ
ягонай, і прут для мераньня. І ён стаяў пры браме.
4 І сказаў мне чалавек той: «Сыне чалавечы, паглядзі вачыма тваімі і паслухай вушамі тваімі,
і зьвярні сэрца тваё на ўсё тое, што я табе пакажу, бо ты прыведзены сюды на тое, каб убачыць
гэта. Паведамі дому Ізраіля пра ўсё, што ты ўбачыш».
5 І вось, мур звонку Дому [Божага] з усіх бакоў навокал, а ў руцэ чалавека таго — меральны
прут на шэсьць локцяў, [лічачы] па локці і далоні. І ён зьмераў шырыню пабудовы — адзін
прут, і вышыня адзін прут.
6 І прыйшоў ён да брамы, якая зьвернута на шлях на ўсход, і ўзыйшоў па сходах, і зьмераў
парог брамы — адзін прут шырыні. І зьмераў другі парог — адзін прут шырыні.
7 І вартоўня — адзін прут даўжыні і адзін прут шырыні, а паміж вартоўнямі — пяць локцяў, і
парог брамы з боку прысенкаў брамы з сярэдзіны — адзін прут.
8 І ён зьмераў прысенак брамы ў [бок] Дому — адзін прут.
9 І ён зьмераў прысенак брамы — восем локцяў, і філяры ягоныя — два локці, і прысенак брамы
— у [бок] Дому.
10 І вартоўні брамы на шляху на ўсход — тры [локці] з гэтага боку і тры з таго боку, усе тры
той самай меры, і філяры той самай меры, як з аднаго, так і з другога боку.
11 І зьмераў шырыню ўваходу праз браму — дзесяць локцяў, даўжыня брамы — трынац- цаць
локцяў.
12 А перагародка перад вартоўнямі — адзін локаць, і адзін локаць з другога боку, а вартоўня —
шэсьць локцяў з аднаго боку і шэсьць локцяў з другога боку.
13 І ён зьмераў браму ад даху вартоўні да другога даху, шырыня была дваццаць пяць локцяў,
дзьверы насупраць дзьвярэй.

14 І зрабіў [абмер] філяраў — шэсьцьдзясят локцяў. І да філяраў [падыходзіць] панадворак
брамы наўкола з усіх бакоў.
15 Ад пярэдняга боку ўваходу праз браму да пярэдняга боку прысенку брамы ўнутранай —
пяцьдзясят локцяў.
16 І закратаваныя вокны [былі] наўкола з усіх бакоў у вартоўнях і ў філярах іхніх у сярэдзіну,
і таксама былі вокны наўкола прысенку ў сярэдзіну, а на філярах — пальмы.
17 І завёў ён мяне на панадворак вонкавы, і вось, пакоі, і ўзвышэньне кругом на панадворку;
трыццаць пакояў [было] на ўзвышэньні.
18 Узвышэньне [было] каля брамы адпаведна даўжыні брамы, [гэта] ніжняе ўзвышэньне.
19 І ён зьмераў шырыню ад пярэдняга боку брамы ніжняй аж да пярэдняга боку ўнутранага
панадворку звонку — сто локцяў на ўсход і на поўнач.
20 І [была] брама, у якой пярэдні бок на шляху на поўнач, на панадворку вонкавым, і ён
зьмераў даўжыню ейную і шырыню ейную.
21 І тры вартоўні ейныя з аднаго боку і тры вартоўні з другога боку; і філяры ейныя, і прысенкі
ейныя былі паводле памераў першай брамы, пяцьдзясят локцяў даўжыня ейная і дваццаць
пяць локцяў шырыня.
22 А вокны ейныя, і прысенкі ейныя, і пальмы [аздабленьня] ейнага былі такія, як у брамы, у
якой пярэдні бок на шляху на ўсход. І па сямі прыступках уваходзяць у яе, і прысенкі ейныя
насупраць іх.
23 І [была] брама ўнутранага панадворку насупраць брамы паўночнай і ўсходняй. І ён зьмераў
ад брамы да брамы — сто локцяў.
24 І завёў ён мяне на шлях на поўдзень, і вось, брама на шляху на поўдзень, і ён зьмераў філяры
ейныя і прысенкі ейныя, і [яны мелі] тыя самыя памеры.
25 Яна і прысенкі ейныя [мелі] вокны з усіх бакоў наўкола, такія самыя як вокны папярэднія;
пяцьдзесят локцяў даўжыня ейная і дваццаць пяць локцяў шырыня.
26 І па сямі прыступках уваходзяць у яе, і прысенкі ейныя насупраць яе; і пальмы
[аздабленьня] ейнага [былі] на філярах з абодвух бакоў.
27 І [была] брама ўнутранага панадворку на шляху на поўдзень; і ён зьмераў ад адной брамы
да другой на шляху на поўдзень — сто локцяў.
28 І ён завёў мяне на ўнутраны панадворак праз браму паўднёвую і зьмераў браму паўднёвую,
і [мела яна] тыя самыя памеры.
29 І вартоўні ейныя, і філяры ейныя, і прысенкі ейныя мелі тыя самыя памеры; яна і прысенкі
ейныя [мелі] вокны з усіх бакоў наўкола; пяцьдзясят локцяў даўжыня ейная і дваццаць пяць
локцяў шырыня.
30 І прысенкі з усіх бакоў наўкола; дваццаць пяць локцяў даўжынёю і пяць локцяў шырынёю.
31 І прысенкі ейныя [былі] пры вонкавым панадворку; і пальмы [аздабленьня] ейнага [былі]
на філярах, і восем прыступак [меў] уваход ейны.
32 І ён завёў мяне на зьнешні панадворак на шляху на ўсход, і зьмераў браму; і [мела яна] тыя
самыя памеры.
33 І вартоўні ейныя, і філяры ейныя, і прысенкі ейныя мелі тыя самыя памеры. Яна і прысенкі
ейныя [мелі] вокны з усіх бакоў наўкола; пяцьдзясят локцяў даўжыня ейная і дваццаць пяць
локцяў шырыня.
34 І прысенкі ейныя [былі] пры вонкавым панадворку; і пальмы [аздабленьня] ейнага [былі]
на філярах, і восем прыступак [меў] уваход ейны.
35 І ён прывёў мяне да брамы паўночнай, і зьмераў яе, і [яна мела] тыя самыя памеры.
36 І вартоўні ейныя, і філяры ейныя, і прысенкі ейныя, і вокны [былі] з усіх бакоў наўкола,
пяцьдзясят локцяў даўжыня ейная і дваццаць пяць локцяў шырыня.
37 І прысенкі ейныя [былі] пры вонкавым панадворку; і пальмы [аздабленьня] ейнага [былі]
на філярах, і восем прыступак [меў] уваход ейны.
38 І [быў] пакой, уваход у які быў пры філярах брамы. Там мылі ахвяры цэласпаленьня.

39 А ў прысенках брамы [былі] два сталы з аднаго боку і два сталы з другога боку для забіваньня
ахвяраў цэласпаленьня, ахвяраў за грэх і ахвяраў аднагараджэньня.
40 А на зьнешнім баку, пры ўваходзе ў браму паўночную, [былі] два сталы, і з другога боку,
пры прысенках брамы, [былі] два сталы;
41 чатыры сталы з аднаго боку і чатыры сталы з другога боку брамы, восем сталоў, на якіх
забівалі [ахвяры].
42 А чатыры сталы на ахвяры цэласпаленьня [былі] з чэсанага камяня, даўжыня [іх] — паўтары
локці, шырыня — паўтары локці, вышыня — адзін локаць; на іх клалі прылады для забіваньня
ахвяраў цэласпаленьня і [іншых] ахвяраў.
43 І паліцы шырынёю ў далонь былі зроблены ў доме наўкола, а на сталах [было] мяса
ахвярнае.
44 А звонку брамы ўнутранай [былі] два пакоі на ўнутраным панадворку, адзін з боку брамы
паўночнай, і пярэдні бок ягоны на шляху на поўдзень, і адзін з боку брамы ўсходняй, і пярэдні
бок ягоны на шляху на поўнач.
45 І ён сказаў мне: «Гэты пакой, у якім пярэдні бок на шляху на поўдзень, — для сьвятароў,
якія спаўняюць службу ў Доме [Божым].
46 А пакой, у якім пярэдні бок на шляху на поўнач, — для сьвятароў, якія спаўняюць службу
пры ахвярніку. Гэта сыны Цадока, якія спаміж сыноў Левія [могуць] набліжацца да ГОСПАДА,
каб служыць Яму».
47 І ён зьмераў панадворак. Быў гэта квадрат у сто локцяў даўжыні і сто локцяў шырыні, і
ахвярнік [стаяў] перад Домам [Божым].
48 І ён увёў мяне ў прысенкі Дому, і зьмераў філяр прысенкаў, і [было] пяць локцяў з аднаго
боку і пяць локцяў з другога боку: а шырыня брамы — тры локці з аднаго боку і тры локці з
другога боку.
49 Даўжыня прысенкаў — дваццаць локцяў, а шырыня — адзінаццаць локцяў, і па прыступках
уваходзяць у яе. І слупы [былі] пры філярах, адзін з аднаго боку, а другі з другога боку.

Эзк 41

1 І ён увёў мяне ў сьвятыню, і зьмераў філяры, і [было] шэсьць локцяў з аднаго боку і шэсьць
локцяў з другога боку, шырыня намёту.
2 Шырыня ўваходу — дзесяць локцяў, а бакі ўваходу — пяць локцяў з аднаго боку і пяць локцяў
з другога боку; і зьмераў даўжыню ягоную — сорак локцяў, і шырыню ягоную — дваццаць
локцяў.
3 І ўвайшоў у сярэдзіну, і зьмераў філяры пры ўваходзе — два локці, а ўваход — шэсьць локцяў,
і шырыня ўваходу — сем локцяў.
4 І зьмераў даўжыню ягоную — дваццаць локцяў, а шырыня — дваццаць локцяў да пярэдняга
боку сьвятыні. І ён сказаў мне: «Гэта Сьвятое Сьвятых».
5 І ён зьмераў мур Дому [Божага] — шэсьць локцяў, а шырыня бакавога пакою — чатыры локці
з усіх бакоў наўкола кругом Дому.
6 І гэтых бакавых пакояў, пакой пры пакоі, — трыццаць у тры шэрагі; і яны абапіраліся на мур,
які пабудаваны ўздоўж Дому з усіх бакоў наўкола для падтрыманьня бакавых пакояў, і [пакоі]
не абапіраліся на мур Дому [Божага].
7 І ён пашыраўся ўгару да бакавых пакояў, бо галерэі ішлі вакол Дому. Дзеля гэтага шырыня
Дому ўгары была большай, і знізу ўваходзілі ў верхні [пакой] праз сярэдні.
8 І я бачыў узвышэньне вакол Дому [Божага] з усіх бакоў. Падваліны бакавых пакояў мелі
[шырыню] на цэлы прут — шэсьць локцяў.
9 Шырыня муру, які з вонкавага боку бакавых пакояў, — пяць локцяў. І вольнае месца ёсьць
паміж бакавымі пакоямі пры Доме [Божым].
10 І паміж пакоямі адлегласьць у дваццаць локцяў з усіх бакоў вакол Дому [Божага].
11 А выхад з бакавога пакою [быў] на адкрытую прастору, адзін выхад на шлях на поўнач, і
адзін выхад на поўдзень, а шырыня вольнага месца — пяць локцяў з усіх бакоў вакол.

12 Будынак, які быў перад адгароджанай прасторай на шляху на захад, [меў] шырыню ў
семдзясят локцяў, мур будынку [меў] шырыню пяць локцяў з усіх бакоў кругом і даўжыню
дзевяноста локцяў.
13 І ён зьмераў Дом [Божы], даўжыня ягоная — сто локцяў, а адгароджаная прастора, будынак
і муры ягоныя — сто локцяў.
14 Шырыня пярэдняга боку Дому з адгароджанай прасторай на ўсход — сто локцяў.
15 І ён зьмераў даўжыню будынку перад адгароджанай прасторай, якая за ім, галерэі з аднаго
і другога боку — сто локцяў. А сьвятыня ўнутраная і прысенкі панадворку,
16 парогі, вокны закратаваныя і галерэі вакол трох [паверхаў] насупраць парогу былі
ашаляваныя дрэвам з усіх бакоў наўкола ад зямлі да вокнаў, а вокны зачыненыя.
17 Над уваходам і аж да ўнутранай [часткі] Дому і навонкі, і на ўсіх сьценах з усіх бакоў
наўкола, унутры і звонку,
18 зроблены херувімы і пальмы, па адной пальме паміж двума херувімамі; і два абліччы ў
[кожнага] херувіма,
19 аблічча чалавечае [зьвернута] да пальмы з аднаго боку, і аблічча льва [зьвернута] ў бок
пальмы з другога боку. І [так] зроблена ў-ва ўсім Доме [Божым] з усіх бакоў наўкола.
20 Ад зямлі аж па-над уваход былі зроблены херувімы і пальмы на сьцяне сьвятыні.
21 Сьвятыня мела чатырохкутныя вушакі, а перад абліччам Сьвятога [Сьвятых] было штосьці,
што выглядала нібыта
22 ахвярнік з дрэва, вышынёю ў тры локці, у два локці даўжыні і ў два локці шырыні, а рогі
ягоныя, падставы і сьценкі ягоныя — з дрэва. І ён прамовіў да мяне: «Гэта стол, які перад
абліччам ГОСПАДА».
23 І Сьвятыня [мела] дзьверы падвойныя, і Сьвятое [Сьвятых].
24 Гэтыя дзьверы падвойныя мелі дзьве форткі рухомыя. Дзьве форткі — адны [дзьверы], і
дзьве форткі — другія.
25 І былі зроблены на іх, на дзьвярах Сьвятыні, херувімы і пальмы; яны зроблены так, як на
сьценах, і ганак драўляны [быў] перад прысенкам звонку,
26 а вокны закратаваныя і пальмы былі з аднаго і з другога боку на сьценах прысенку, і ў
бакавых пакоях Дому [Божага], і на ганку.

Эзк 42

1 І ён вывеў мяне на панадворак вонкавы шляхам у накірунку на поўнач і завёў мяне ў пакой,
які насупраць адгароджанай прасторы і насупраць будынку з паўночнага боку.
2 З пярэдняга боку даўжыня ягоная — сто локцяў, выхад на поўнач, а шырыня — пяцьдзясят
локцяў.
3 Насупраць — дваццаць [локцяў] панадворку ўнутранага, і насупраць — узвышэньне, якое на
панадворку вонкавым, і галерэі адна ўздоўж другой на трох [паверхах].
4 А перад пакоямі праход шырынёю ў дзесяць локцяў унутры, на адлегласьць у сто локцяў, і
ўваход у яго з поўначы.
5 Верхнія пакоі былі вузейшыя за ніжнія і сярэднія [пакоі] будынку, бо галерэі займалі частку
[прасторы].
6 Былі яны трохпавярховыя і ня мелі слупоў такіх, як слупы на панадворках, і таму былі
вузейшыя за ніжнія і сярэднія, якія на зямлі.
7 А мур, які звонку ўздоўж пакояў у накірунку вонкавага панадворку насупраць пакояў, [меў]
даўжыню ў пяцьдзясят локцяў.
8 Бо даўжыня пакояў, якія пры вонкавым панадворку, — пяцьдзясят локцяў, а тых, што перад
Сьвятыняй — сто локцяў.
9 А пад тымі пакоямі — праход ад усходу, калі ўваходзіць у іх з вонкавага панадворку.
10 На шырыню муру панадворку шляхам на поўдзень перад адгароджанай прасторай і перад
будынкам — пакоі.

11 І дарога перад імі, як [уваход] у пакоі, якія на шляху на поўнач, як у даўжыню, так і ў
шырыню, з усімі іхнімі выхадамі, уладкаваньнямі і ўваходамі.
12 А ўваходы ў пакоі, якія на шляху на поўдзень, былі як уваход на пачатку праходу, які перад
адпаведным мурам, на шляху на ўсход, калі ўваходзіць у яго.
13 І сказаў ён мне: «Пакоі паўночныя і пакоі паўднёвыя, якія перад адгароджанай прасторай,
гэта пакоі сьвятыя, дзе сьвятары, якія набліжаюцца да ГОСПАДА, спажываюць сьвятое
сьвятых; там яны складаюць сьвятое сьвятых, ахвяры хлебныя, ахвяры за грэх і ахвяры
аднагараджэньня, бо гэта месца сьвятое.
14 Калі сьвятары ідуць [пасьля служэньня], яны не павінны выходзіць з гэтага месца сьвятога
на вонкавы панадворак, але там скінуць шаты свае, у якіх [спраўляюць] служэньне сваё,
бо яны сьвятыя, і апрануць шаты іншыя, і [тады] наблізяцца да [месца, прызначанага] для
народу».
15 І ён скончыў мераць унутраныя [будынкі] Дому [Божага], павёў мяне шляхам да брамы,
зьвернутай на шлях на ўсход, і зьмераў з усіх бакоў наўкола.
16 Ён зьмераў бок усходні прутом меральным: пяцьсот прутоў прутом меральным наўкола.
17 Зьмераў бок паўночны: пяцьсот прутоў прутом меральным наўкола.
18 І зьмераў бок паўднёвы: пяцьсот прутоў прутом меральным.
19 І павярнуўся да заходняга боку, і намераў пяцьсот прутоў прутом меральным.
20 Ён зьмераў чатыры бакі. Мур быў з усіх бакоў наўкола даўжынёю ў пяцьсот і шырынёю ў
пяцьсот [прутоў], каб аддзяліць сьвятое ад звычайнага.

Эзк 43

1 І ён павёў мяне да брамы, брамы, якая была зьвернута на шлях на ўсход.
2 І вось, слава Бога Ізраіля прыйшла па шляху з усходу, а голас Ягоны — быццам шум водаў
вялікіх, і зямля сьвяцілася ад славы Ягонай.
3 І выгляд таго, што я бачыў, такі, як выгляд таго, што я бачыў, калі прыйшоў, каб зьнішчыць
горад, выгляд такі, як выгляд таго, што я бачыў над ракой Кевар. І я ўпаў на аблічча маё.
4 І слава ГОСПАДА ўвайшла ў Дом [Божы] праз браму, якая была скіраваная на шлях на ўсход.
5 І падняў мяне дух, і завёў на ўнутраны панадворак. І вось, слава ГОСПАДА напоўніла Дом.
6 І я пачуў Таго, Хто прамовіў да мяне з Дому [Божага], а той муж стаяў каля мяне.
7 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, [гэта] месца пасаду Майго, месца стопаў ног Маіх, дзе Я
буду вечна жыць сярод сыноў Ізраіля. І больш не апаганіць дом Ізраіля імя Маё сьвятое, яны і
валадары іхнія, распустаю сваёю і парэшткамі валадароў сваіх на ўзгорках іхніх.
8 Яны паставілі парог свой каля парогу Майго і вушакі свае каля вушакоў Маіх, так што [толькі]
сьцяна была паміж Мною і імі, і апаганілі яны імя Маё сьвятое брыдотамі сваімі, якія рабілі, і
Я вынішчыў іх у гневе Маім.
9 Цяпер няхай яны аддаляць ад Мяне распусту сваю і парэшткі валадароў сваіх, і Я буду жыць
сярод іх на вякі.
10 А ты, сыне чалавечы, паведамі дому Ізраіля пра Дом гэты, і яны будуць саромецца
беззаконьняў сваіх, і няхай зьмераюць [памеры] ўзору гэтага.
11 І калі яны будуць саромецца з прычыны ўсяго, што зрабілі, паведамі ім выгляд Дому гэтага
і ўладкаваньне яго, выхады ягоныя і ўваходы ягоныя, і ўсе рысункі ягоныя, і ўсе правілы
ягоныя, і ўсе пастановы ягоныя, і ўсе законы ягоныя, і запішы іх перад вачыма іхнімі, каб яны
трымаліся ўсіх рысункаў гэтых і ўсіх пастановаў гэтых, і выканалі іх».
12 Гэта закон Дому [Божага].На вяршыні гары ўвесь абшар з усіх бакоў наўкола — Сьвятое
Сьвятых. Вось гэта закон Дому гэтага.
13 А гэта памеры ахвярніка ў локцях, лічачы локаць па адным локці і адной далоні. Аснова
[ягоная] — локаць і шырыня локаць, а абрамаваньне на краі ягоным кругом — адна пядзя.
Гэта вышыня ахвярніка:
14 ад асновы на зямлі да ніжняга абрамаваньня — два локці, а шырыня — адзін локаць, а ад
малога абрамаваньня да вялікага абрамаваньня — чатыры локці, а шырыня — локаць.
15 Вогнішча [на ахвяры] — чатыры локці, і з вогнішча ўгару — чатыры рагі.

16 Вогнішча [мае] дванаццаць [локцяў] даўжыні і дванаццаць [локцяў] шырыні,
чатырохкутнае, на чатыры свае бакі [роўнае].
17 Абрамаваньне — чатырнаццаць [локцяў] даўжыні і чатырнаццаць [локцяў] шырыні на
чатыры бакі свае, а ўзьмежак, які вакол яго, — палову локця, а аснова ягоная — локаць наўкола.
А прыступкі ягоныя скіраваныя на ўсход.
18 І Ён сказаў мне: «Сыне чалавечы, гэта кажа Госпад ГОСПАД. Вось пастановы адносна
ахвярніка на дзень, калі ён будзе пабудаваны, каб на ім складаць цэласпаленьні і каб
акрапляць яго крывёй.
19 І ты дасі сьвятарам лявітам, якія з насеньня Цадока і маюць набліжацца да Мяне, кажа Госпад
ГОСПАД, каб служыць Мне, бычка, сына ялаўкі, як [ахвяру] за грэх.
20 І возьмеш крыві ягонай, і пакропіш ёю чатыры рагі ахвярніка, і чатыры рагі абрамаваньня і
ўзьмежак наўкола, і ачысьціш яго, і будзеш перамольваць [за яго].
21 І возьмеш бычка ахвяры за грэх, і спаліш яго на вызначаным месцы Дому [Божага] па-за
[месцам] сьвятым.
22 А на другі дзень ахвяруеш казла без заганы як ахвяру за грэх, і ачысьціш ахвярнік так, як
ачысьцілі яго, [ахвяроўваючы] бычка.
23 І калі скончыш ачышчэньне, ахвяруеш бычка, сына ялаўкі, без заганы, і барана спаміж
авечак без заганы.
24 І ахвяруеш іх перад абліччам ГОСПАДА, і сьвятары кінуць на іх соль, і ахвяруюць іх як
цэласпаленьне для ГОСПАДА.
25 Сем дзён будзеш ахвяроўваць казла як ахвяру за грэх штодзень. І ахвяруеш бычка, сына
ялаўкі, і барана спаміж авечак, без заганы.
26 Сем дзён будзеш перамольваць за ахвярнік, і ачышчаць яго, і будуць напоўненыя рукі
[сьвятароў].
27 І скончацца тыя дні, і станецца ў восьмы дзень і пазьней, што сьвятары будуць ахвяроўваць
на ахвярніку цэласпаленьні вашыя і ахвяры мірныя вашыя, і Я буду для вас спагадны, кажа
Госпад ГОСПАД».

Эзк 44

1 І завярнуў мяне на шлях зьнешняй брамы [месца] сьвятога, скіраванай на ўсход, і яна была
замкнёная.
2 І сказаў мне ГОСПАД: «Брама гэтая будзе замкнёная, і ня будзе адчыняцца, і ніводзін чалавек
ня ўвойдзе праз яе, бо ГОСПАД, Бог Ізраіля, увайшоў праз яе, і яна будзе замкнёная.
3 Князь, [толькі] князь будзе сядзець у ёй, каб спажываць хлеб перад абліччам ГОСПАДА.
Шляхам праз прысенкі пры браме ўвойдзе і тым самым шляхам выйдзе».
4 І завёў мяне шляхам брамы паўночнай перад аблічча Дому [Божага], і я ўбачыў, і вось, слава
ГОСПАДА напоўніла Дом ГОСПАДА, і я ўпаў на аблічча маё.
5 І сказаў мне ГОСПАД: «Сыне чалавечы, зьвярні сэрца тваё, і пабач вачыма тваімі, і паслухай
вушамі тваімі ўсё, што Я скажу табе адносна ўсіх пастановаў Дому ГОСПАДА і адносна ўсіх
законаў ягоных, і зьвярні сэрца тваё на ўсе ўваходы ў Дом гэты і на ўсе выхады з [месца]
сьвятога.
6 І скажаш да бунтаўнікоў, да дому Ізраіля: “Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Хопіць ужо ўсіх
брыдотаў вашых, дом Ізраіля.
7 Вы ўвялі чужынцаў, неабрэзаных сэрцам і неабрэзаных целам, каб яны былі ў сьвятыні Маёй,
і паганілі Дом Мой, калі складалі ў ахвяру хлеб Мой, тлушч і кроў; і парушылі запавет Мой
брыдотамі сваімі,
8 і не пільнавалі служэньня сьвятога Майго, і паставілі іх пільнаваць варту Маю ў сьвятыні
Маёй.
9 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Ніводзін чужынец, неабрэзаны сэрцам і неабрэзаны целам, ня
ўвойдзе ў сьвятыню Маю, ніводзін чужынец, які сярод сыноў Ізраіля.
10 А тыя лявіты, якія аддаліліся ад Мяне, калі блукаў Ізраіль, калі адступіў ад Мяне, [ідучы] за
ідаламі сваімі, яны панясуць беззаконьне сваё.

11 І будуць яны ў сьвятыні Маёй служыць як вартаўнікі пры брамах Дому гэтага і абслугоўваць
Дом гэты, яны будуць забіваць [ахвяры] цэласпаленьня і ахвяры крывавыя для народу, і
будуць стаяць перад імі, каб служыць ім.
12 За тое, што яны служылі ім перад абліччам ідалаў іхніх і сталіся для дому Ізраіля прычынай
беззаконьня, Я ўзьняў руку Маю супраць іх, кажа Госпад ГОСПАД, і яны панясуць беззаконьні
свае.
13 І яны не наблізяцца да Мяне, каб быць сьвятарамі для Мяне і каб набліжацца да ўсіх
сьвятасьцяў Маіх, да Сьвятога Сьвятых, і будуць насіць ганьбу сваю і брыдоты свае, якія
ўчынілі.
14 І Я прызначу іх вартаўнікамі на варце Дому гэтага, да ўсякіх працаў і да ўсяго, што трэба
будзе зрабіць у ім.
15 Але сьвятары лявіты, сыны Цадока, якія вартавалі варту сьвятыні Маёй, калі сыны Ізраіля
адыйшлі ад Мяне, яны наблізяцца да Мяне, каб служыць Мне і стаяць перад абліччам Маім,
каб ахвяроўваць Мне тлушч і кроў, кажа Госпад ГОСПАД.
16 Яны будуць уваходзіць у сьвятыню Маю, і яны будуць набліжацца да стала Майго, каб
служыць Мне і вартаваць варту Маю.
17 І станецца, калі яны будуць уваходзіць у брамы ўнутранага панадворку, яны апрануць
шаты ільняныя; няхай не апранаюць на сябе воўну, калі вартуюць пры брамах унутранага
панадворку і ў Доме гэтым.
18 Турбаны ільняныя будуць на галовах іхніх і порткі ільняныя будуць на сьцёгнах іхніх. Ня
будуць яны падпярэзвацца, каб не пацець.
19 А калі будуць выходзіць на вонкавы панадворак, на панадворак вонкавы да народу, яны
здымуць шаты свае, у якіх яны служылі, і пакладуць у пакоях сьвятых, і апрануць іншыя шаты,
каб не асьвячаць народ, [дакранаючыся] шатамі сваімі.
20 І галавы сваёй яны ня будуць галіць, і ня будуць запускаць [доўгіх] валасоў, але, стрыгучы,
будуць стрыгчы галовы свае.
21 І ня будзе піць віна кожны сьвятар, калі будуць уваходзіць на ўнутраны панадворак.
22 І ўдавы або пакінутай ня возьмуць яны за жонку, але толькі дзяўчыну з насеньня дому
Ізраіля ці ўдаву, якая стала ўдавой па мужу сьвятару.
23 І яны будуць навучаць народ Мой [адрозьніваць] паміж тым, што сьвятое, і тым, што
звычайнае, і будуць вучыць [адрозьніваць] паміж тым, што нячыстае, і тым, што чыстае.
24 У справах спрэчных яны стануць, каб судзіць у судзе і судом Маім, судзячы, судзіць іх. І
будуць захоўваць закон Мой і пастановы Мае ў-ва ўсіх урачыстасьцях Маіх, і суботы Мае будуць
сьвяціць.
25 І да мёртвага чалавека не падыйдуць, каб не занячысьціцца, толькі дзеля бацькі, маці, сына,
дачкі, брата і сястры, якая ня мела мужа, могуць яны занячысьціцца.
26 А пасьля ачышчэньня свайго адлічаць яму яшчэ сем дзён.
27 І ў дзень, калі ён увойдзе ў сьвятыню, на ўнутраны панадворак, каб служыць у сьвятыні, ён
ахвяруе за грэх свой, кажа Госпад ГОСПАД.
28 І [гэта] будзе ім за спадчыну. Я — спадчына іхняя. І не дасьцё ім уласнасьці ў Ізраілі, бо Я —
уласнасьць іхняя.
29 Ахвяры хлебныя, ахвяры за грэх і ахвяры аднагараджэньня будуць яны спажываць, і ўсё,
што пад закляцьцем у Ізраілі, будзе іхнім.
30 І найлепшае з усіх пяршынаў, і кожны дар, усё спаміж дароў вашых будзе для сьвятароў. І
найлепшае цеста вашае дайце сьвятарам, каб дабраславенства супачывала на доме вашым.
31 Аніякай падліны і таго, што разьдзёртае, ці з птушак, ці з быдла, ня будуць есьці сьвятары.

Эзк 45

1 Калі будзеце кідаць жэрабя пра зямлю на спадчыну, выдзеліце сьвяты дар для ГОСПАДА
з зямлі, даўжынёю на дваццаць пяць тысячаў [прутоў] і шырынёю на дваццаць тысячаў
[прутоў]. Ён сьвяты ў-ва ўсім абшары сваім наўкола.

2 З гэтага да сьвятыні будзе [належаць] чатырохкутнік пяцьсот на пяцьсот [прутоў] наўкола,
а на пяцьдзясят локцяў вакол будзе вольнае месца.
3 А з гэтага абсягу адмераеш [абшар] даўжынёю ў дваццаць пяць тысячаў [прутоў] і шырынёю
ў дзесяць тысячаў [прутоў], і на ім будзе сьвятыня, Сьвятое Сьвятых.
4 Гэта сьвятая [частка] зямлі; яна будзе для сьвятароў, якія служаць пры сьвятыні, якія
набліжаюцца, каб служыць ГОСПАДУ; і будзе гэта для іх месца на дамы і [месцам] сьвятым
для сьвятыні.
5 І [абшар] даўжынёю ў дваццаць пяць тысячаў [прутоў] і шырынёю ў дзесяць тысячаў [прутоў]
будзе для лявітаў, якія служаць пры Доме гэтым; для іх на ўласнасьць дваццаць пакояў.
6 А на ўласнасьць гораду дасьцё [абшар] шырынёю ў пяць тысячаў [прутоў] і даўжынёй у
дваццаць пяць тысячаў [прутоў], насупраць сьвятой часткі. Гэта будзе для ўсяго дому Ізраіля.
7 А для князя [будзе абшар] па абодвух баках часткі сьвятой і ўласнасьці гораду ўздоўж часткі
сьвятой і ўздоўж уласнасьці горада з боку заходняга на захад і з боку ўсходняга на ўсход, і
даўжыня такая, як частка [калена] ад мяжы заходняй да мяжы ўсходняй.
8 Гэта зямля будзе яму на ўласнасьць у Ізраілі, і ня будуць больш уціскаць князі народ Мой,
але дадуць зямлю дому Ізраіля паводле каленаў ягоных.
9 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: “Досыць вам, князі Ізраіля! Кіньце гвалт і прыгнёт, а чыніце суд і
праведнасьць! Пакіньце выганяць [з зямлі] народ Мой, кажа Госпад ГОСПАД”.
10 Няхай у вас будзе вага праведная, эфа праведная і бат праведны.
11 Эфа і бат няхай будуць аднолькавай меры, так, каб бат меў дзясятую частку гомара і эфа
мела дзясятую частку гомара. Паводле гомара будзе мера іхняя.
12 Сыкль [мае мець] дваццаць гэраў; дваццаць сыкляў, дваццаць пяць сыкляў і пятнаццаць
сыкляў няхай будзе для вас міна.
13 Гэта ёсьць дар, які вы будзеце прыносіць: шостую частку эфы з гомару пшаніцы і шостую
частку эфы з гомару ячменю.
14 І пастанова пра алей адносна бату алею — дзясятая частка бату з кору, дзесяць батаў — гэта
гомар, бо дзесяць батаў — гомар.
15 І адно ягня з двухсот авечак з пашаў Ізраіля — на ахвяру хлебную, на цэласпаленьне і ахвяру
мірную, каб ачысьціць іх, кажа Госпад ГОСПАД.
16 Увесь народ зямлі гэтай будзе дары гэтыя даваць князю Ізраіля.
17 А князь мае рупіцца пра цэласпаленьне, ахвяру хлебную і вадкую на сьвяты, маладзікі,
суботы і на ўсе ўрачыстасьці дому Ізраіля. Ён робіць ахвяру за грэх, ахвяру хлебную,
цэласпаленьні і ахвяры мірныя, каб ачысьціць дом Ізраіля.
18 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. У першым [месяцы], у першы [дзень] месяца возьмеш бычка,
сына ялаўкі, без заганы, і ачысьціш сьвятыню.
19 І возьме сьвятар кроў ахвяры за грэх, і пакрапіць ёю вушакі [дзьвярэй] Дому [Божага],
чатыры рагі абрамаваньня ахвярніка, вушакі брамы ўнутранага панадворку.
20 І так зробіш у сёмы [дзень першага] месяца, за кожнага, хто саграшыў праз няўвагу або
бязглуздасьць, і ачысьціце Дом [Божы].
21 У першым [месяцы], у чатырнаццаты дзень месяца будзе ў вас Пасха, сьвята сямі- дзённае,
калі будзеце есьці праснакі.
22 І князь у той дзень складзе бычка як ахвяру за грэх, за сябе і за ўвесь народ зямлі.
23 І сем дзён сьвята ён будзе ахвяроўваць цэласпаленьне для ГОСПАДА, сем бычкоў, сем
бараноў без заганы штодзень сем дзён, і як ахвяру за грэх штодзень аднаго казла.
24 І складзе ахвяру хлебную, эфу на бычка і эфу на барана, і гін алею на эфу.
25 У сёмым [месяцы], у пятнаццаты дзень месяца ў сьвята будзе ён ахвяроўваць сем дзён як
ахвяру за грэх, так і цэласпаленьне, як ахвяру хлебную, так і алей.

Эзк 46

1 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: Брама ўнутранага панадворку, зьвернутая на ўсход, будзе
замкнёная шэсьць дзён працы, а ў дзень адпачынку будзе адчыненая, і ў дзень маладзіка будзе

адчыненая.
2 І ўвойдзе князь праз прысенкі брамы звонку, і стане каля вушакоў брамы. І складуць
сьвятары цэласпаленьне і ахвяру мірную, а ён паклоніцца на парозе брамы, і выйдзе, а брама
ня будзе замкнёная аж да вечара.
3 І будзе пакланяцца народ зямлі пры ўваходзе брамы гэтай у суботы і ў маладзікі перад
абліччам ГОСПАДА.
4 І цэласпаленьне, якое князь складзе для ГОСПАДА ў дзень суботы — шэсьць ягнятаў без
заганы і баран без заганы.
5 І ахвяра хлебная — эфа на барана, а на ягнятаў ахвяра хлебная — колькі дасьць рука ягоная,
і гін алею на эфу.
6 А ў дзень маладзіка няхай будзе бычок, сын ялаўкі, без заганы, шэсьць ягнятаў і баран без
заганы.
7 І эфу на бычка, і эфу на барана складзе ён як ахвяру хлебную, а на ягнятаў — колькі дасьць
рука ягоная, і гін алею на эфу.
8 А калі будзе прыходзіць князь, ён увойдзе шляхам праз прысенкі брамы і выйдзе тым самым
шляхам.
9 А калі народ зямлі ў час урачыстасьці будзе прыходзіць перад аблічча ГОСПАДА, той,
хто прыйшоў шляхам праз браму паўночную, каб пакланіцца, выйдзе шляхам праз браму
паўднёвую, а хто ўвайшоў шляхам праз браму паўднёвую, выйдзе шляхам праз браму
паўночную. Ніхто ня вернецца шляхам праз тую браму, праз якую ўвайшоў, але выйдзе праз
супрацьлеглую.
10 І князь [будзе] пасярод іх. Калі яны ўваходзяць, і ён увойдзе, і калі яны выходзяць, і ён
выйдзе.
11 У сьвяты і ўрачыстасьці будзе ахвяра хлебная — эфа на бычка і эфа на барана; а на ягнятаў
— колькі дасьць рука ягоная, і гін алею на эфу.
12 А калі князь зробіць дар дабраахвотны, ці цэласпаленьне, ці ахвяру мірную як дар
дабраахвотны для ГОСПАДА, няхай адчыняць яму браму, зьвернутую на ўсход, і няхай ён
складзе цэласпаленьне сваё і ахвяру мірную сваю так, як гэта робіць у дзень суботы, і выйдзе,
і замкнуць браму пасьля адыходу ягонага.
13 І ягня аднагадовае без заганы складзеш як цэласпаленьне штодзень для ГОСПАДА, кожную
раніцу будзеш складаць яго.
14 А як ахвяру хлебную пры ім кожную раніцу складзеш адну шостую эфы і адну трэцюю
гіну алею, каб акрапіць найлепшую муку як ахвяру хлебную для ГОСПАДА. [Гэта] пастанова
вечная, назаўсёды.
15 І будуць складаць ягня і ахвяру хлебную, і алей кожную раніцу, цэласпаленьне заўсёднае.
16 Гэта кажа Госпад ГОСПАД. Калі князь дасьць дар аднаму з сыноў сваіх са спадчыны сваёй,
гэта будзе належаць сынам ягоным, гэта ўласнасьць іхняя ў спадчыну.
17 А калі ён дасьць дар з уласнасьці сваёй аднаму са слугаў сваіх, гэта будзе належаць да яго аж
да году вызваленьня ягонага, і вернецца да князя. Толькі тая ўласнасьць, якую ён [даў] сынам
сваім, для іх будзе.
18 І ня возьме князь са спадчыны народу, забіраючы ў іх уласнасьць іхнюю. З уласнасьці сваёй
ён дасьць спадчыну сынам сваім, каб ніхто з народу Майго ня быў пазбаўлены ўласнасьці
сваёй”».
19 І ён правёў мяне праз уваход, які з боку ад брамы, у пакоі сьвятыя для сьвятароў, якія
зьвернутыя на поўнач. І вось, там месца ў найдалейшым баку з заходняга боку.
20 І ён сказаў мне: «Гэта месца, дзе сьвятары будуць варыць ахвяры аднагараджэньня і
ахвяры за грэх, дзе будуць пячы ахвяры хлебныя, каб не выносіць іх на вонкавы панадворак,
асьвячаючы [гэтым] народ».
21 І ён завёў мяне на вонкавы панадворак, і правёў мяне каля чатырох кутоў панадворку. І
вось, панадворкі ў кожным куце панадворку.
22 У чатырох кутах панадворку [былі] малыя панадворкі, даўжынёю ў сорак [локцяў] і
шырынёю ў трыццаць [локцяў]. Усе чатыры мелі той самы памер.

23 І мур кругом тых чатырох з усіх бакоў, а ніжэй, пры муры, былі вогнішчы наўкола.
24 І ён сказаў мне: «Гэта дом на гатаваньне, дзе тыя, якія служаць пры Доме гэтым, будуць варыць ахвяры народу».

Эзк 47

1 І ён завёў мяне да ўваходу ў Дом [Божы]. І вось, вада выцякала з-пад парогу Дому [Божага] на ўсход, бо пярэдні бок Дому гэтага [быў] на ўсход; а вада выцякала з-пад правага боку Дому, з паўднёвага боку ад ахвярніка.
2 І ён вывеў мяне шляхам праз браму паўночную, і павёў мяне звонку вакол да вонкавай брамы шляхам, скіраваным на ўсход. І вось вада выцякала з-пад правага боку Дому.
3 І выйшаў той муж на ўсход, і шнур [меральны] ў руцэ ягонай. І ён адмерыў тысячу локцяў, і перавёў мяне праз ваду, і вада [была] да костак.
4 І ён адмерыў тысячу [локцяў], і перавёў мяне праз ваду, і вада была да каленяў. І ён адмерыў тысячу [локцяў], і перавёў мяне, і вада была да паясьніцы.
5 І ён адмерыў тысячу [локцяў], [і быў] струмень, праз які ня мог я перайсьці, бо вада ўзьнялася, [і стала] вада для плаваньня, струмень, праз які нельга перайсьці.
6 І ён сказаў мне: «Ці ты бачыў [гэта], сыне чалавечы?» І ён павёў мяне, і завёў на бераг струмяня гэтага.
7 Калі я вярнуўся, вось, з абодвух бакоў на беразе струмяня вельмі шмат дрэваў.
8 І ён сказаў мне: «Вада гэтая цячэ на абшар усходні, і зыходзіць на стэп, упадае ў Мора [Салёнае], і разьліваецца ў моры, і воды тыя становяцца здаровымі.
9 І станецца, што ўсякая душа жывая, якая там множыцца, куды толькі прыйдзе струмень гэты, будзе жыць, і будзе там вельмі шмат рыбы, бо куды дацякуць тыя воды, там [усё] будзе аздароўлена і будзе жыць усё там, куды дацячэ струмень гэты.
10 І станецца, што будуць над ім стаяць рыбакі, ад Эн-Геды аж да Эн-Эгляіму, і будзе гэта месца на стаўленьне сетак, і будуць там рыбы паводле гатунку свайго, як рыбы з Мора Вялікага, [будзе іх] вельмі шмат.
11 Але балоты ягоныя і затокі ягоныя ня будуць аздароўлены, бо яны дадзеныя для солі.
12 А пры струмяні на беразе ягоным з аднаго і другога боку будуць расьці ўсялякія дрэвы пладовыя, і лісьце іхняе ня зьвяне, і плады іхнія ня спыняцца, кожны месяц будуць яны радзіць новыя [плады], бо воды гэтыя выходзяць са сьвятыні. І будуць плады іхнія на ежу, а лісьце іхняе — на лекі».
13 Гэта кажа Госпад ГОСПАД: «Гэта мяжа, у якой вы ўспадкаеміце зямлю для дванаццаці каленаў Ізраіля. Язэп [будзе мець] дзьве часткі.
14 І вы ўспадкаеміце яе, кожны так, як брат ягоны, бо Я ўзьняў руку Маю, што дам яе бацькам вашым. І будзе зямля гэтая для вас у спадчыну.
15 Гэта межы зямлі: з паўночнага боку ад Мора Вялікага ў накірунку да Хэтлёну, як ісьці ў Цэдаду,
16 Хамат, Бэроту і Сібраім, якія паміж мяжой Дамаску і мяжой Хамату, Хацар-Гатыхону, які на мяжы Хаўрану.
17 І будзе мяжа ад Мора да Хацар-Энону, паўночная мяжа Дамаску і мяжа Хамату на поўначы. Гэта бок паўночны.
18 А з боку ўсходняга — паміж Хаўранам і Дамаскам, паміж Гілеадам і зямлёй Ізраіля, па Ярдану мяжу аж да Мора Усходняга вы будзеце мерыць. Гэта бок усходні.
19 А з боку паўднёвага ў правы бок — ад Тамару аж да водаў Мэрывот-Кадэшу, уздоўж ручая да Мора Вялікага. Гэта бок паўднёвы з правага боку ў бок Нэгеву.
20 А з боку заходняга — Мора Вялікае ад мяжы аж да месца насупраць уваходу ў Хамат. Гэта бок заходні.
21 І вы падзеліце зямлю гэтую для сябе паводле дванаццаці каленаў Ізраіля.

22 І станецца, што вы падзеліце яе жэрабем на спадчыну для вас і для прыхадняў, якія жывуць
сярод вас і якія нарадзілі сыноў сярод вас, і будуць яны для вас як тутэйшыя сярод сыноў
Ізраіля, разам з вамі яны кінуць жэрабя пра спадчыну сярод каленаў Ізраіля.
23 І станецца, што ў тым калене, у якім жыве прыхадзень, дасьцё яму спадчыну ягоную, кажа
Госпад ГОСПАД.

Эзк 48

1 Вось імёны каленаў. Ад канца паўночнага ў бок шляху на Хэтлён, як ісьці да Хамату, да Хацар-
Энону, на мяжы Дамаску, на поўначы ў бок Хамату, ад усходу да захаду, — частка Дана.
2 А пры мяжы Дана ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Асэра.
3 А пры мяжы Асэра ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Нэфталі.
4 А пры мяжы Нэфталі ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Манасы.
5 А пры мяжы Манасы ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Эфраіма.
6 А пры мяжы Эфраіма ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Рубэна.
7 А пры мяжы Рубэна ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Юды.
8 А пры мяжы Юды ад боку ўсходняга да боку заходняга будзе дар, які вы прынясеце, [частка]
шырынёю ў дваццаць пяць тысячаў [прутоў] і даўжынёю як адна з частак [каленаў] ад боку
ўсходняга да боку заходняга, і будзе сьвятыня на сярэдзіне яе.
9 Гэта дар, які вы прынясеце для ГОСПАДА, даўжынёю ў дваццаць пяць тысячаў [прутоў] і
шырынёю ў дзесяць тысячаў [прутоў].
10 І гэта будзе частка сьвятая для сьвятароў: на поўнач дваццаць пяць тысячаў [прутоў], на
захад дзесяць тысячаў [прутоў], на ўсход дзесяць тысячаў [прутоў], на поўдзень дваццаць пяць
тысячаў [прутоў], і будзе сьвятыня ГОСПАДА на сярэдзіне яе.
11 Для сьвятароў пасьвячоных з сыноў Цадока, якія пільнавалі служэньне Маё, якія не блукалі,
калі блукалі сыны Ізраіля, як блукалі лявіты,
12 будзе частка са [сьвятога] дару зямлі, як сьвятое сьвятых, побач з часткаю лявітаў.
13 А лявіты маюць [частку] побач з часткай сьвятароў, даўжынёю ў дваццаць пяць тысячаў
[прутоў] і шырынёю ў дзесяць тысячаў [прутоў], разам доўгая на дваццаць пяць тысячаў
[прутоў] і шырокая на дзесяць тысячаў [прутоў].
14 Ня будуць прадаваць з яе нічога, і ня будуць замяняць, і ніхто не забярэ што найлепшае з
зямлі гэтай, бо яна сьвятая для ГОСПАДА.
15 А пяць тысячаў [прутоў], якія яшчэ засталіся з шырыні ў дваццаць пяць тысячаў [прутоў],
будуць звычайныя, і будуць для гораду для засяленьня і на пашу, а горад будзе пасярэдзіне.
16 Вось памеры ягоныя: бок паўночны — чатыры тысячы пяцьсот [прутоў]; бок паўднёвы —
чатыры тысячы пяцьсот [прутоў], бок усходні — чатыры тысячы пяцьсот [прутоў], бок заходні
— чатыры тысячы пяцьсот [прутоў].
17 І будзе паша для гораду: на поўнач — дзьвесьце пяцьдзясят [прутоў], на поўдзень
— дзьвесьце пяцьдзясят [прутоў], на ўсход — дзьвесьце пяцьдзясят [прутоў], на захад —
дзьвесьце пяцьдзясят [прутоў].
18 А тое, што засталося з даўжыні насупраць часткі сьвятой, [мае] дзесяць тысячаў [прутоў]
на ўсход і дзесяць тысячаў [прутоў] на захад. І будзе яно каля часткі сьвятой, і ўраджай ягоны
будзе на хлеб для работнікаў гораду.
19 Будуць яго апрацоўваць работнікі гораду, якія з усіх каленаў Ізраіля.
20 Уся частка [сьвятая] будзе мець [памер] дваццаць пяць тысячаў [прутоў] на дваццаць пяць
тысячаў [прутоў]; чатырохкутнік, прынесены як дар сьвяты з уласнасьці гораду.
21 А рэшта — для князя з аднаго і другога боку часткі сьвятой і ўласнасьці гораду, уздоўж тых
дваццаці пяці тысячаў [прутоў] аж да мяжы ўсходняй, а на захадзе ўздоўж тых дваццаці пяці
тысячаў [прутоў] аж да мяжы заходняй, насупраць частак каленаў, гэта для князя, і будзе
частка сьвятая і сьвятыня пасярэдзіне.
22 Уласнасьць лявітаў і ўласнасьць гораду будзе пасярод таго, што належыць князю. Паміж
мяжой Юды і мяжой Бэн'яміна будзе [частка] князя.

23 А рэшта каленаў: ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Бэн’яміна.
24 А пры мяжы Бэн’яміна ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Сымона.
25 А пры мяжы Сымона ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Ісахара.
26 А пры мяжы Ісахара ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Завулёна.
27 А пры мяжы Завулёна ад боку ўсходняга да боку заходняга — частка Гада.
28 А пры мяжы Гада з боку паўднёвага ў правы бок будзе мяжа ад Тамару да водаў Мэрывот-Кадэшу і ўздоўж ручая да Мора Вялікага.
29 Гэта зямля, якую падзеліце жэрабем як спадчыну паміж каленаў Ізраіля, і гэта часткі іхнія, кажа Госпад ГОСПАД.
30 І вось выхады з гораду. З боку паўночнага, які [мае] чатыры тысячы пяцьсот [прутоў] даўжыні,
31 брамы гораду [названыя] паводле імёнаў каленаў Ізраіля. Тры брамы з боку паўночнага: адна брама Рубэна, адна брама Юды і адна брама Левія.
32 З боку ўсходняга, які [мае] чатыры тысячы пяцьсот [прутоў], тры брамы: адна брама Язэпа, адна брама Бэн’яміна і адна брама Дана.
33 З боку паўднёвага, які [мае] чатыры тысячы пяцьсот [прутоў], тры брамы: адна брама Сымона, адна брама Ісахара і адна брама Завулёна.
34 З боку заходняга, які [мае] чатыры тысячы пяцьсот [прутоў], тры брамы: адна брама Гада, адна брама Асэра і адна брама Нэфталі.
35 Наўкола [горад] мае васямнаццаць тысячаў [прутоў]. А імя гораду будзе з таго дня: “ГОСПАД там!”»

КНІГА ПРАРОКА ДАНІІЛА

1 У трэці год валадараньня Егаякіма, валадара Юды, прыйшоў Навухаданосар, валадар
Бабілону, да Ерусаліму і аблёг яго.
2 І аддаў Госпад у руку ягоную Егаякіма, валадара Юды, і частку начыньняў Дому Божага, і ён
занёс іх у зямлю Шынэар у дом бога свайго, і ўнёс начыньні гэтыя ў скарбніцу бога свайго.
3 І сказаў валадар Ашпэназу, начальніку эўнухаў сваіх, каб ён прывёў з сыноў Ізраіля і з
насеньня валадарскага і княскага
4 юнакоў, якія ня маюць у сабе аніякай заганы, [маюць] добры выгляд, разумеюць усякую
мудрасьць, і кемлівыя ў навучаньні, і здольныя да ведаў, каб яны мелі сілу стаяць у палацы
валадарскім і каб навучыць іх кнігам і мове халдэйскай.
5 І вызначыў ім валадар на кожны дзень ежу валадара і віно, якое сам піў, каб гадаваць іх так
тры гады, каб пасьля заканчэньня іх яны сталі перад абліччам валадара.
6 І былі сярод іх з сыноў Юды Даніил, Ананія, Мішаэль і Азарыя.
7 І даў ім начальнік эўнухаў імёны, Даніілу даў [імя] Бэльтэшацар, Ананію — Шадрах, Мішаэлю
— Мэшах, а Азарыі — Авэд-Нэго.
8 І пастанавіў Даніил у сэрцы сваім, што ён ня будзе апаганьвацца ежаю валадара і віном, якое
той піў; і ён прасіў начальніка эўнухаў, каб яму не апаганіцца.
9 І даў Бог Даніілу міласэрнасьць і спагаду перад абліччам начальніка эўнухаў.
10 І сказаў начальнік эўнухаў Даніілу: «Я баюся пана майго, валадара, які вызначыў для вас
ежу і напоі. Бо калі ён убачыць, што абліччы вашыя марнейшыя, чым у [іншых] юнакоў вашага
веку, тады вы наразіце на небясьпеку галаву маю перад валадаром».
11 І сказаў Даніил наглядчыку, якога начальнік эўнухаў паставіў над Даніілам, Ананіем,
Мішаэлем і Азарыем:
12 «Выспрабуй, калі ласка, слугаў тваіх дзён дзесяць; і няхай даюць нам гародніну, і мы будзем
есьці, і ваду, і мы будзем піць.
13 І паглядзіш на выгляд наш і выгляд юнакоў, якія ядуць ежу валадара; і паводле таго, што
ўбачыш, рабі са слугамі тваімі».
14 І ён паслухаў іх у гэтай справе, і выспрабоўваў іх дзесяць дзён.
15 І ў канцы дзесяці дзён выгляд іхні выяўвіўся лепшым і цела [іхняе было] здаравейшым, чым
у юнакоў, якія елі ежу валадара.
16 І сталася, што наглядчык забіраў ад іх ежу і віно, якое яны мелі піць, і даваў ім гародніну.
17 І гэтым чатыром юнакам Бог даў веды і разуменьне кожнай кнігі і мудрасьці, а Даніил
разумеў усякія відзежы і сны.
18 І пасьля заканчэньня дзён, калі валадар сказаў прывесьці іх, начальнік эўнухаў прывёў іх
перад аблічча Навухаданосара.
19 І гаварыў з імі валадар, і не знайшлося сярод іх усіх [такіх], як Даніил, Ананія, Мішаэль і
Азарыя. І яны сталі перад абліччам валадара.
20 І ў-ва ўсіх справах мудрасьці і разуменьня, пра што валадар пытаўся ў іх, ён знайшоў іх
у дзесяць разоў [лепшымі] за ўсіх варажбітоў і астролягаў, якія [былі] ў-ва ўсім валадарстве
ягоным.
21 І Даніил быў [там] да першага году валадара Кіра.

Дан 2

1 У другім годзе валадараньня Навухаданосара сьніў Навухаданосар сны, і дух ягоны
стрывожыўся, і сон ягоны адыйшоў ад яго.
2 І сказаў валадар паклікаць варажбітоў, астролягаў, чараўнікоў і Халдэяў, каб распавялі
валадару сны ягоныя. І яны прыйшлі, і сталі перад абліччам валадара.
3 І сказаў валадар ім: «Сьніў я сон, і стрывожыўся дух мой, бо [хачу] ведаць сон».

4 І гаварылі Халдэі валадару па-арамейску: «Валадару! Жыві на вякі! Раскажы сон слугам тваім, і яго значэньне мы патлумачым».
5 Адказаў валадар і сказаў Халдэям: «Слова адыйшло ад мяне. Але калі вы не паведаміце мне [мой] сон і значэньне ягонае, вы будзеце пасечаныя [на кавалкі], і дамы вашыя будуць ператвораныя ў руіны.
6 А калі сон і значэньне ягонае патлумачыце, атрымаеце ад мяне дары, нагароду і ўшанаваньне вялікае. Дзеля гэтага сон і значэньне ягонае растлумачце мне».
7 Яны адказалі другі раз і сказалі: «Няхай раскажа валадар слугам тваім сон, і мы патлумачым значэньне ягонае».
8 Адказаў валадар і сказаў: «Ведаю дакладна, што вы цягнеце час, бо бачыце, што адыйшло ад мяне слова.
9 Але калі вы не паведаміце мне сон [мой], значыцца, адзін намер у вас, бо вы згадзіліся словы падманлівыя і фальшывыя казаць перада мною, пакуль ня пройдзе час. Дзеля гэтага раскажыце мне сон, і я даведаюся, што вы патлумачыце мне значэньне ягонае».
10 Адказалі Халдэі валадару і сказалі: «Няма на зямлі чалавека, які мог бы патлумачыць справу валадара. Дзеля гэтага ніякі валадар вялікі і магутны не патрабуе такога ў чараўніка, астроляга і Халдэя.
11 А гэтая справа, якую валадар патрабуе, цяжкая, і няма нікога, хто мог бы выявіць яе перад валадаром, акрамя багоў, якія не жывуць з цялеснымі [людзьмі]».
12 З-за гэтага валадар загневаўся і зазлаваўся моцна, і сказаў выгубіць усіх мудрацоў Бабілонскіх.
13 І пастанова выйшла, каб мудрацы былі забітыя, і шукалі Даніила і сяброў ягоных, каб забіць іх.
14 Тады Даніил зьвярнуўся з радаю і разумнасьцю да Арыёха, начальніка варты валадара, які выйшаў, каб забіваць мудрацоў Бабілонскіх.
15 Ён адказаў і сказаў Арыёху, гетману валадара: «Чаму такі жорсткі загад валадара?» Тады Арыёх паведаміў гэтую справу Даніилу.
16 І Даніил пайшоў і прасіў валадара, каб той даў яму час, і ён патлумачыць валадару значэньне [сну].
17 Тады Даніил пайшоў у дом свой і паведаміў справу гэтую Ананіі, Мішаэлю і Азарыі, сябрам сваім,
18 каб яны прасілі літасьці ў Бога Нябеснага адносна таямніцы гэтай, каб не загінулі Даніил і сябры ягоныя разам з рэштаю мудрацоў Бабілонскіх.
19 Тады Даніилу ў відзежы начным была выяўлена таямніца, і Даніил дабраславіў Бога Нябеснага.
20 Адказаў Даніил і сказаў: «Няхай будзе дабраслаўлёнае імя Божае ад веку і на вякі, бо мудрасьць і сіла ў Яго.
21 І Ён зьмяняе часы і поры, Ён скідае валадароў і ставіць валадароў, дае мудрасьць мудрым і веданьне тым, якія маюць розум.
22 Ён выяўляе глыбокае і схаванае; Ён ведае, што ў цемры, і сьвятло жыве з Ім.
23 Дзякую Табе і слаўлю Цябе, Божа бацькоў маіх, што мудрасьць і сілу Ты даў мне, а цяпер паведаміў мне тое, пра што прасілі мы ў Цябе, бо Ты паведаміў нам справу валадара».
24 Пасьля гэтага Даніил пайшоў да Арыёха, якога валадар прызначыў, каб ён выгубіў мудрацоў Бабілонскіх. Ён прыйшоў і сказаў яму гэтак: «Не забівай мудрацоў Бабілонскіх. Прывядзі мяне да валадара, і я патлумачу валадару значэнне [сну]».
25 Тады Арыёх пасьпешліва прывёў Даніила да валадара і сказаў яму гэтак: «Я знайшоў чалавека з сыноў палону, з Юдэяў, які паведаміць валадару значэньне [сну]».
26 Адказаў валадар і сказаў Даніилу, якога імя [было] Бэльтэшацар: «Ці ты можаш паведаміць мне сон, які я бачыў, і значэньне ягонае?»
27 Адказаў Даніил валадару і сказаў: «Таямніцу, якую валадар патрабуе, ня могуць патлумачыць валадару ані мудрацы, ані астролягі, ані чараўнікі, ані варажбіты.
28 Але ёсьць Бог у небе, Які выяўляе таямніцы, і Ён паведамляе валадару Навухаданосару, што мае быць у канцы дзён. Сон твой і відзеж галавы тваёй на ложку тваім гэткія.

29 Да цябе, валадару, думкі твае на ложку тваім прыйшлі пра тое, што мае быць пасьля гэтага,
і Той, Які выяўляе таямніцы, паказаў табе, што станецца.
30 Але мне таямніца гэтая выяўлена не з прычыны мудрасьці, што яна ёсьць у-ва мне больш,
чым у-ва ўсіх, хто жыве, але дзеля таго, каб паведаміць валадару значэньне [сну] і каб ты мог
ведаць думкі сэрца твайго.
31 Ты, валадару, глядзеў, і вось, адзін балван вялікі, балван вялізарны, і бляск ягоны
надзвычайны. Ён стаяў перад табою, і выгляд ягоны [быў] страшны.
32 У балвана гэтага галава з чыстага золата, грудзі ягоныя і рамёны ягоныя — са срэбра, жывот
ягоны і сьцёгны ягоныя — з медзі,
33 галёнкі ягоныя — з жалеза, стопы ягоныя — часткова з жалеза, а часткова з гліны.
34 Ты глядзеў, аж вось камень быў адарваны, але не рукамі, і ўдарыў [камень] у балвана, у
стопы ягоныя з жалеза і гліны, і разьбіў іх.
35 Тады разьбіліся на кавалкі жалеза, гліна, медзь, срэбра і золата і сталіся як мякіна на таку
летам, і вецер панёс іх, і ніякага сьледу не знайшлося пасьля іх. А камень, які ўдарыў балвана,
стаў гарою вялізарнаю і напоўніў усю зямлю.
36 Гэтакі сон [быў], а значэньне ягонае [цяпер] раскажам перад валадаром.
37 Ты, валадару, — валадар валадароў, якому Бог нябесны даў валадарства, моц, сілу і славу.
38 І паўсюль, дзе жывуць сыны чалавечыя, зьвяры палявыя і птушкі нябесныя, Ён даў [іх] у
руку тваю і паставіў цябе панам над усімі імі. Ты — гэта тая галава з золата.
39 А пасьля цябе паўстане іншае валадарства, ніжэйшае за цябе, і іншае трэцяе валадарства з
медзі, якое будзе панаваць над усёю зямлёю.
40 А чацьвёртае валадарства будзе моцнае, як жалеза; бо як жалеза ломіць і крышыць усё, і як
жалеза таўчэ ўсё, так яно зломіць і скрышыць [усё].
41 А тое, што ты бачыў стопы і пальцы часткова з гліны ганчарнай, а часткова з жалеза,
[значыць, што] валадарства будзе падзеленае, і будзе ў ім нешта з моцнасьці жалеза, бо ты
бачыў жалеза, зьмяшанае з глейкаю глінай.
42 І як пальцы ног часткова з жалеза, а часткова з гліны, так валадарства будзе часткова
моцнае, а часткова крохкае.
43 І як ты бачыў жалеза, зьмяшанае з глейкаю глінай, так яны будуць зьмяшаныя насеньнем
людзкім, але ня будуць злучаныя адно з адным, як жалеза не мяшаецца з глінаю.
44 А ў дні валадароў тых Бог Нябесны паставіць валадарства, якое вечна ня будзе зьнішчана,
і гэтае валадарства ня будзе пераходзіць да іншага народу; яно скрышыць і зруйнуе ўсе
валадарствы, а само будзе стаяць на вякі,
45 бо ты бачыў, што ад гары быў адарваны камень, але не рукамі, і ён разьбіў жалеза, медзь,
гліну, срэбра і золата. Бог вялікі паказаў валадару тое, што станецца пасьля. І сон гэты
праўдзівы, і значэньне яго дакладнае».
46 Тады валадар Навухаданосар упаў на аблічча сваё, і пакланіўся Даніілу, і загадаў, каб
прынесьлі яму дары і кадзіла.
47 Валадар адказаў Даніілу і сказаў: «Сапраўды, Бог ваш — Бог багоў і Гаспадар валадароў! Ён
выяўляе таямніцы, бо ты змог выявіць таямніцу гэтую».
48 Тады валадар узьвялічыў Даніила і даў яму шмат вялікіх дароў, і зрабіў яго панам над усёй
краінай Бабілонскай і галоўным начальнікам над усімі мудрацамі Бабілонскімі.
49 І Даніил прасіў валадара, і ён паставіў над справамі краіны Бабілонскай Шадраха, Мэшаха і
Авэд-Нэго, а Даніил [быў] пры браме валадарскай.

Дан 3

1 Навухаданосар валадар зрабіў балвана з золата, вышыня ягоная — шэсцьдзясят локцяў, а
шырыня ягоная — шэсьць локцяў. Ён паставіў яго на раўніне Дура ў краіне Бабілонскай.
2 І Навухаданосар валадар паслаў сабраць князёў, начальнікаў і ваяводаў, судзьдзяў,
скарбнікаў, раднікаў, урадоўцаў і ўсіх кіраўнікоў акругаў, каб яны прыйшлі на асьвячэньне
балвана, якога паставіў Навухаданосар валадар.

3 Тады сабраліся князі, начальнікі і ваяводы, судзьдзі, скарбнікі, раднікі, урадоўцы і ўсе
кіраўнікі акругаў на асьвячэньне балвана, якога паставіў Навухаданосар валадар, і сталі яны
перад балванам, якога паставіў Навухаданосар валадар.
4 І весьнік голасна клікаў: «Вам паведамляецца, народы, плямёны і мовы!
5 У час, калі пачуеце гук трубы, жалейкі, арфы, ліры, псалтыра, дуды і ўсялякіх музычных
інструмэнтаў, упадзіце і пакланіцеся балвану залатому, якога паставіў Навухаданосар
валадар.
6 А хто не ўпадзе і не паклоніцца, у той жа момант будзе кінуты ў сярэдзіну печы, якая палае
агнём».
7 Дзеля гэтага ў той час, калі ўсе народы пачулі гук трубы, жалейкі, арфы, ліры, псалтыра, дуды
і ўсялякіх музычных інструмэнтаў, усе народы, плямёны і мовы ўпалі і пакланіліся балвану
залатому, якога паставіў Навухаданосар валадар.
8 Дзеля гэтага ў той момант наблізіліся [да валадара] мужы Халдэйскія і абвінавацілі зласьліва
Юдэяў.
9 Яны адказалі і сказалі Навухаданосару валадару: «Валадару, жыві на вякі!
10 Ты, валадару, выдаў загад, каб кожны чалавек, які пачуе гук трубы, жалейкі, арфы, ліры,
псалтыра, дуды і ўсялякіх музычных інструмэнтаў, упаў і пакланіўся балвану залатому.
11 А хто не ўпадзе і не паклоніцца, той будзе кінуты ў сярэдзіну печы, якая палае агнём.
12 Ёсьць мужы Юдэйскія, якіх ты паставіў над справамі краіны Бабілонскай, Шадрах, Мэшах
і Авэд-Нэго. Гэтыя мужы, валадару, не зважаюць на твой, валадару, загад, багам тваім ня
служаць, і балвану залатому, якога ты паставіў, не пакланяюцца».
13 Тады Навухаданосар у гневе і ў лютасьці сказаў прывесьці Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго.
Тады мужоў гэтых прывялі да валадара.
14 Адказаў Навухаданосар і сказаў ім: «Ці праўда, Шадрах, Мэшах і Авэд-Нэго, што вы багам
маім ня служыце і балвану залатому, якога я паставіў, не пакланяецеся?
15 Цяпер ці вы гатовыя, каб у час, калі пачуеце гук трубы, жалейкі, арфы, ліры, псалтыра, дуды
і ўсялякіх музычных інструмэнтаў, упасьці і пакланіцца балвану, якога я зрабіў? Але калі вы
не паклоніцеся, у той жа момант будзеце кінутыя ў сярэдзіну печы, якая палае агнём. І хто
той Бог, Які выратуе вас з рук маіх?»
16 Адказалі Шадрах, Мэшах і Авэд-Нэго і сказалі валадару: «Навухаданосар! Няма нам патрэбы
адказваць табе ў гэтай справе.
17 Калі Бог наш, Якому мы служым, можа выратаваць нас з печы, якая палае агнём, Ён і з рукі
тваёй, валадару, вызваліць.
18 А [нават] калі не [вызваліць], няхай будзе вядома табе, валадару, што багам тваім мы ня
будзем служыць і балвану залатому, якога ты паставіў, ня будзем пакланяцца».
19 Тады Навухаданосар напоўніўся гневам супраць Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго, і выгляд
аблічча ягонага зьмяніўся. Ён адказаў і сказаў, каб распалілі печ у сем разоў болей, чым была
яна распаленая.
20 А ваярам-асілкам, якія [былі] ў войску ягоным, сказаў зьвязаць Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго
і ўкінуць у печ, якая палае агнём.
21 Тады мужы гэтыя былі зьвязаныя ў плашчах іхніх, кашулях іхніх, турбанах іхніх і ў адзеньні
іхнім і кінутыя ў сярэдзіну печы, якая палае агнём.
22 А як слова валадара было жорсткае, печ была распалена надзвычайна, і мужоў тых, якія
схапілі Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго, забіла полымя агню.
23 А гэтыя тры мужы, Шадрах, Мэшах і Авэд-Нэго, упалі зьвязаныя ў сярэдзіну печы, якая палае
агнём.
24 Тады Навухаданосар валадар зьдзівіўся і ўстаў пасьпешліва, адказаў і сказаў раднікам сваім:
«Ці ня трох мужоў зьвязаных мы кінулі ў сярэдзіну печы?» Яны адказалі і сказалі валадару:
«Дакладна, валадару».
25 Ён адказаў і сказаў: «Але я бачу чатырох мужоў незьвязаных, якія ходзяць сярод агню, і
пашкоджаньня няма на іх, а выгляд чацьвёртага падобны да Сына Божага».

26 Тады наблізіўся Навухаданосар да адтуліны печы, якая палае агнём, і сказаў: «Шадрах,
Мэшах і Авэд-Нэго, слугі Таго, Хто ёсьць Богам Найвышэйшым, выйдзіце і прыйдзіце». Тады
выйшлі Шадрах, Мэшах і Авэд-Нэго з сярэдзіны агню.
27 І сабраліся начальнікі і раднікі валадара, і ўбачылі мужоў гэтых, што над целам іхнім агонь
ня меў улады, і валасы галоваў іхніх не былі апаленыя, і плашчы іхнія не зьмяніліся, і паху
агню не было ад іх.
28 Адказаў Навухаданосар і сказаў: «Дабраслаўлёны Бог Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго, Які
паслаў анёла Свайго і выратаваў слугаў Сваіх, якія спадзяваліся на Яго, і не паслухалі слова
валадара, і аддалі целы свае, каб не служыць і не пакланяцца іншаму богу, акрамя Бога іхняга.
29 Дзеля гэтага я выдаю загад, што ўсякі з народу, племені і мовы, хто скажа блюзьнерства на
Бога Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго, будзе пасечаны на кавалкі, а дом ягоны будзе ператвораны
ў руіну, бо няма іншага Бога, Які мог бы гэтак выратаваць».
30 Тады валадар узвысіў Шадраха, Мэшаха і Авэд-Нэго ў краіне Бабілонскай.
31 «Навухаданосар валадар — усім народам, плямёнам і мовам, якія жывуць на ўсёй зямлі:
супакой ваш няхай памножыцца!
32 Знакі і цуды, якія ўчыніў мне Бог Найвышэйшы, было мне даспадобы выявіць [вам].
33 Якія вялікія знакі Ягоныя і якія магутныя цуды Ягоныя! Валадарства Ягонае — валадарства
вечнае, і ўлада Ягоная — з пакаленьня ў пакаленьне!

Дан 4

1 Я, Навухаданосар, быў у супакоі ў доме маім і шчасьлівы ў палацы маім.
2 Я бачыў сон, і ён напалохаў мяне, і думкі на ложку маім, і відзежы галавы маёй устрывожылі
мяне.
3 І ад мяне быў выдадзены загад прывесьці да мяне ўсіх мудрацоў Бабілонскіх, каб яны маглі
патлумачыць мне значэньне сну.
4 Тады прыйшлі чараўнікі, астролягі, Халдэі і варажбіты, і я расказаў перад імі сон, але яны не
патлумачылі мне значэньне ягонае.
5 І ў канцы прыйшоў да мяне Данііл, якога імя Бэльтэшацар паводле імя бога майго і ў якім
Дух Сьвятога Бога, і я расказаў перад ім сон:
6 “Бэльтэшацар, начальнік чараўнікоў! Я ведаю, што ў табе Дух Сьвятога Бога, і ніякая
таямніца ня цяжкая для цябе. Раскажы мне відзеж сну майго, які я бачыў, і значэньне ягонае.
7 А відзеж галавы маёй на ложку маім [такі]: я бачыў, вось, пасярод зямлі дрэва, і вышыня
ягоная вялікая.
8 Дрэва вырасла і было моцнае, і вышыня ягоная дасягала неба, і было відаць яно аж да канца
ўсёй зямлі.
9 Лісьце ягонае прыгожае, і пладоў ягоных шмат, і для ўсіх [ёсьць] ежа на ім; пад ім мелі цень
зьвяры палявыя, а ў галінах ягоных жылі птушкі нябесныя, і ад яго жывілася кожнае цела.
10 Я бачыў у відзежах галавы маёй на ложку маім, і вось, Вартаўнік Сьвяты зыйшоў з неба.
11 Ён голасна клікаў і гэтак сказаў: “Сьсячыце дрэва і абсячыце галіны ягоныя, абтрасіце
лісьце ягонае і рассыпце плады ягоныя. Няхай зьвяры зыйдуць з-пад яго, птушкі нябесныя
— з галінаў ягоных.
12 Але пень каранёў ягоных пакіньце ў зямлі ў ланцугах мядзяных сярод зеляніны палявой. І
няхай раса нябесная мочыць яго, і са зьвярамі частка ягоная ў траве зямлі.
13 Сэрца чалавечае няхай заменяць у яго, і сэрца жывёлы няхай дадуць яму, і сем пораў няхай
праміне пад ім.
14 Паводле пастановы Вартаўнікоў загад гэты, і паводле слова Сьвятых вырак гэты, каб ведалі
[ўсе] жывыя, што Найвышэйшы пануе над валадарствам чалавечым і дае яго, каму хоча, і
найніжэйшага з людзей ставіць над ім”.
15 Гэты сон бачыў я, валадар Навухаданосар. А ты, Бэльтэшацар, раскажы значэньне [ягонае],
бо ўсе мудрацы валадарства майго не маглі патлумачыць мне значэньне, а ты можаш, бо Дух
Сьвятога Бога ў табе”.

16 Тады Даніил, якога імя Бэльтэшацар, аслупянеў на адзін момант, і думкі ягоныя
ўстрывожылі яго. Адказаў валадар і сказаў: “Бэльтэшацар, сон альбо значэньне ягонае няхай
не трывожыць цябе”. Адказаў Бэльтэшацар і сказаў: “Пане мой, пане мой, няхай сон гэты
[будзе] тым, якія ненавідзяць цябе, і значэньне ягонае — для ворагаў тваіх.
17 Дрэва, якое ты бачыў, якое вырасла і было моцнае, і вышыня ягоная дасягала неба, і было
відаць яно на ўсёй зямлі,
18 і лісьце ягонае прыгожае, і пладоў ягоных шмат, і ежа для ўсіх [ёсьць] на ім, пад ім жылі
зьвяры палявыя, і ў галінах ягоных птушкі нябесныя сяліліся, —
19 гэта ты, валадару, які вырас і стаў магутным, і вялікасьць твая вырасла і дасягнула неба, і
ўлада твая — да канца зямлі.
20 А што валадар бачыў Вартаўніка Сьвятога, Які зыйшоў з неба і сказаў: “Сьсячыце дрэва гэтае
і зьнішчыце яго, але пакіньце пень каранёў ягоных у зямлі ў ланцугах жалезных і мядзяных
сярод зеляніны палявой, і няхай раса нябесная мочыць яго, і са зьвярамі палявымі частка
ягоная, аж пакуль сем пораў праміне над ім,” —
21 вось значэньне, валадару, і вось пастанова Найвышэйшага, якая прыйдзе на пана майго,
валадара.
22 І выганяць цябе ад людзей, і са зьвярамі палявымі будзе жытло тваё, і будуць даваць табе
есьці траву, як валам, і будзе раса нябесная мачыць цябе, і сем пораў праміне над табою,
пакуль ты даведаешся, што Найвышэйшы пануе над валадарствам чалавечым і дае яго, каму
хоча.
23 А што сказалі пакінуць пень каранёў дрэва, [азначае, што] валадарства тваё застанецца пры
табе аж пакуль ты даведаешся, што пануе неба [над табою].
24 Дзеля гэтага, валадару, няхай рада [мая] будзе даспадобы табе, і скасуй грэх твой
праведнасьцю, а правіны твае — міласэрнасьцю да бедных. Можа, гэтым ты прадоўжыш
дабрабыт твой”.
25 Усё гэта прыйшло на Навухаданосара валадара.
26 Напрыканцы дванаццаці месяцаў, шпацыруючы па палацы валадарскім у Бабілоне,
27 адказаў валадар і сказаў: “Хіба не вялікі гэты Бабілон, які я пабудаваў як дом валадарства
моцаю сілы маёй дзеля славы і велічы маёй?”
28 Калі яшчэ слова было ў вуснах валадара, голас з неба зыйшоў: “Табе кажуць, Навухаданосар
валадар! Валадарства адыйшло ад цябе.
29 І выганяць цябе ад людзей, і са зьвярамі палявымі будзе жытло тваё, і будуць даваць табе
есьці траву, як валам, і сем пораў праміне над табою, пакуль ты даведаешся, што Найвышэйшы
пануе над валадарствам чалавечым і дае яго, каму хоча”.
30 У той жа момант слова споўнілася над Навухаданосарам, і ён быў выгнаны ад людзей, і еў
траву, як вол, і раса нябесная мачыла цела ягонае, ажно валасы ягоныя вырасьлі як [пер’е]
арла, і пазногці ягоныя — як [кіпцюры] птушак.
31 І калі скончыліся дні гэтыя я, Навухаданосар, узьняў вочы мае да неба, і розум мой вярнуўся
да мяне, і я дабраславіў Найвышэйшага, выхваляў і ўславіў Таго, Які жыве на вякі, бо ўлада
Ягоная — улада вечная, і валадарства Ягонае — з пакаленьня ў пакаленьне,
32 і ўсе жыхары зямлі нічога ня значаць, а Ён дзейнічае паводле волі Сваёй сярод войска
нябеснага і сярод жыхароў зямлі; і ніхто ня можа стрымаць руку Ягоную і сказаць Яму: “Што
Ты робіш?”
33 У той час розум мой вярнуўся да мяне, і слава валадарства майго, веліч мая і выгляд мой
вярнуліся да мяне. І раднікі мае, і магнаты мае шукалі мяне, і я ўмацаваўся на валадарстве
сваім, і маестат яшчэ большы быў дадзены мне.
34 Цяпер я, Навухаданосар, выхваляю, вывышаю і слаўлю Валадара Нябеснага, бо ўсе ўчынкі
Ягоныя — праўда, і шлях Ягоны — правасудзьдзе, Ён можа панізіць тых, якія ходзяць пыхліва».

Дан 5

1 Бэльшацар валадар справіў банкет вялікі для магнатаў сваіх і перад вачыма тысячы піў віно.

2 Бэльшацар сказаў, калі пакаштаваў віна, каб прынесьлі начыньне залатое і срэбнае, якое
вынес Навухаданосар, бацька ягоны, са сьвятыні, што ў Ерусаліме, каб пілі з іх валадар,
магнаты ягоныя, жонкі ягоныя і наложніцы ягоныя.
3 Тады прынесьлі начыньні залатыя, якія былі ўзятыя са сьвятыні, з Дома Божага, што ў
Ерусаліме, і пілі з іх валадар, магнаты ягоныя, жонкі ягоныя і наложніцы ягоныя.
4 Пілі віно і хвалілі багоў залатых і срэбных, мядзяных, жалезных, драўляных і каменных.
5 У той момант зьявіліся пальцы рукі чалавечай і пісалі насупраць сьвечніка на тынку сьцяны
палацу валадара, і валадар бачыў пясьць рукі, якая пісала.
6 Тады ў валадара зьмяніўся выгляд, і думкі ягоныя ўстрывожылі яго, вязі сьцёгнаў ягоных
саслабелі, і калені ягоныя біліся адно аб адно.
7 Крыкнуў валадар моцна, каб прывялі астролягаў, Халдэяў і варажбітоў. Адказаў валадар і
сказаў мудрацам Бабілонскім: «Кожны чалавек, які прачытае гэты надпіс і патлумачыць мне
значэньне ягонае, будзе апрануты ў пурпур, і залаты ланцуг [будзе] на шыі ягонай, і трэцім у
валадарстве ён будзе панаваць».
8 Тады прыйшлі ўсе мудрацы валадара, але не маглі прачытаць надпісу і паведаміць валадару
значэньне ягонае.
9 Тады валадар Бэльшацар вельмі ўстрывожыўся, і выгляд ягоны зьмяніўся, і магнаты ягоныя
былі зьбянтэжаныя.
10 З прычыны словаў валадара і магнатаў ягоных валадарка ўвайшла ў дом банкетаваньня.
Адказала валадарка і сказала: «Валадару, жыві на вякі! Няхай не трывожаць цябе думкі твае,
і выгляд твой няхай не зьмяняецца!
11 Ёсьць муж у валадарстве тваім, у якім Дух Сьвятога Бога. І ў дні бацькі твайго знойдзены
былі ў ім сьвятло і розум, і мудрасьць, як мудрасьць Божая, і валадар Навухаданосар, бацька
твой, валадару, прызначыў яго начальнікам чараўнікоў, астролягаў, Халдэяў і вяшчуноў.
12 Бо надзвычайны дух і веданьне, і разуменьне, каб тлумачыць сны, вырашаць загадкі і
разьвязваць вузлы былі знойдзены ў ім, у Даніілу, якога валадар назваў імем Бэльтэшацар.
Цяпер няхай паклічуць Даніила, і ён патлумачыць значэньне [напісанага]».
13 Тады Даніил быў прыведзены да валадара. Адказаў валадар і сказаў Даніілу: «Ці ты той
Даніил з сыноў выгнаньня Юдэйскага, якога валадар, бацька мой, прывёў з Юдэі?
14 І я чуў пра цябе, што Дух Божы ў табе, і сьвятло, і розум, і мудрасьць незвычайная знойдзены
ў табе.
15 І цяпер былі прыведзены да мяне мудрацы і астролягі, каб прачыталі гэты надпіс і
паведамілі мне значэньне ягонае, але яны не змаглі значэньне слова гэтага патлумачыць мне.
16 І я чуў пра цябе, што ты можаш тлумачыць значэньне [сноў] і разьвязваць вузлы. Цяпер,
калі можаш прачытаць гэты надпіс і паведаміць мне значэньне ягонае, ты будзеш апрануты ў
пурпур, і ланцуг залаты [будзе] на шыі тваёй, і трэцім у валадарстве будзеш панаваць».
17 Адказаў Даніил і сказаў валадару: «Няхай дары твае будуць табе, а падарункі твае дай
іншаму! Але надпіс я прачытаю для валадара і паведамлю табе значэньне ягонае.
18 Ты — валадар. Бог Найвышэйшы даў Навухаданосару, бацьку твайму, валадарства і веліч, і
славу, і маестат.
19 Дзякуючы велічы, якую Ён даў яму, усе народы, плямёны і мовы трымцелі і жахаліся перад
ім. Каго хацеў, таго забіваў, і каго хацеў, таго пакідаў жывым; і каго хацеў, таго вывышаў, і
каго хацеў, таго паніжаў.
20 Але калі сэрца ягонае ўзвысілася і дух ягоны вырас у пыхлівасьці, ён быў скінуты з пасаду
валадарства свайго, і слава ягоная была забраная ад яго,
21 і ад сыноў чалавечых быў ён выгнаны, і сэрца ягонае стала падобным да зьвярынага, і з
дзікімі асламі [было] жытло ягонае, кармілі яго травой, як валоў, і раса нябесная мачыла цела
ягонае, пакуль ён не даведаўся, што Бог Найвышэйшы пануе над валадарствам чалавечым і
ставіць над ім, каго хоча.
22 А ты, сын ягоны, Бэльшацар, не скарыў сэрца твайго, хоць ты ведаў усё гэта.
23 І ты падняўся супраць Госпада Нябеснага, і начыньні Дому Ягонага прынесьлі да цябе, і ты,
і магнаты твае, і жонкі твае, і наложніцы твае пілі віно з іх, і ты ўслаўляў багоў срэбных і

залатых, мядзяных, жалезных, драўляных і каменных, якія ня бачаць і ня чуюць, і ня ведаюць,
а Бога, у руцэ Якога дыханьне тваё і ў Якога ўсе шляхі твае, ты не праславіў.
24 Дзеля гэтага была пасланая ад Яго пясьць рукі, і гэты надпіс быў напісаны.
25 І гэты надпіс, які напісаны: “Мэнэ, Мэнэ, Тэкел, Упарсін”.
26 Вось значэньне словаў: “Мэнэ” — палічыў Бог валадарства тваё і [прызначыў] канец яму.
27 “Тэкел” — ты ўзважаны на шалях і знойдзены недастатковым;
28 “Пэрэс” — падзелена валадарства тваё і дадзена Мідзянам і Пэрсам».
29 Тады сказаў Бэльшацар, і апранулі Даніила ў пурпур, і ланцуг залаты [ўсклалі] на шыю
ягоную, і абвясьцілі пра яго, што ён будзе панаваць як трэці ў валадарстве.
30 У тую ноч быў забіты Бэльшацар, валадар Халдэйскі.
31 І Дарый Мідзянін атрымаў валадарства, маючы шэсцьдзясят два гады.

Дан 6

1 Спадабалася Дарыю паставіць над валадарствам сто дваццаць князёў, якія будуць над усім
валадарствам,
2 а над імі — трох маршалкаў, адным з якіх [быў] Даніил, каб гэтыя князі давалі справаздачы
ім і каб валадар ня меў ніякай страты.
3 Гэты Даніил пераўзыходзіў маршалкаў і князёў, бо ў яго быў дух надзвычайны, і валадар
думаў паставіць яго над усім валадарствам.
4 Тады маршалкі і князі шукалі прычыны, каб абвінаваціць Даніила ў справах валадарства, але
ніякай прычыны ці заганы не маглі знайсьці, бо ён быў верны, і ніякае занядбаньне ці загана
не былі знойдзены ў ім.
5 Тады сказалі тыя людзі: «Мы ня знойдзем супраць Даніила гэтага нейкую прычыну [для
абвінавачваньня], хіба толькі знойдзем нешта супраць яго ў Законе Бога ягонага».
6 Тады тыя маршалкі і князі пасьпяшаліся да валадара і гэтак сказалі яму: «Дарый валадар,
жыві на вякі!
7 Парадзіліся ўсе маршалкі валадарства, начальнікі, князі, раднікі і ваяводы, каб выдаць
пастанову валадарскую і зрабіць пастанову, што калі хто на працягу трыццаці дзён будзе
прасіць просьбаю якога бога або чалавека, а не цябе, валадару, той будзе кінуты ў роў з ільвамі.
8 Цяпер, валадару, зацьвердзь пастанову і падпішы ліст, які ня можа быць зьменены, як закон
Мідзянаў і Пэрсаў, які не зьмяняецца».
9 Тады валадар Дарый падпісаў ліст і пастанову.
10 А Даніил, калі даведаўся, што падпісаны ліст, пайшоў у дом свой, і вокны ў пакоі ягоным
былі адчыненыя ў бок Ерусаліму, і тройчы ў дзень ён схіліў калені свае і маліўся, і дзякаваў
Богу свайму так, як рабіў перад гэтым.
11 Тады мужы тыя пасьпяшаліся і знайшлі Даніила, які ўзносіў просьбы і маленьні да Бога
свайго.
12 Тады яны наблізіліся і сказалі валадару пра пастанову валадарскую: «Ці ж ты не падпісаў
пастанову, што кожны чалавек, які будзе прасіць на працягу трыццаці дзён [гэтых] якога бога
або чалавека, а не цябе, валадару, будзе кінуты ў роў з ільвамі?» Валадар адказаў і сказаў:
«Праўдзівае слова гэтае, як закон Мідзянаў і Пэрсаў, які не зьмяняецца».
13 Тады яны адказалі і сказалі перад валадаром: «Даніил, які з сыноў выгнаньня Юдэйскага,
не зважае на пастанову тваю, валадару, і на забарону, якую ты падпісаў, але тройчы ў дзень
узносіць малітву сваю».
14 Калі валадар пачуў гэтыя словы, ён вельмі засмуціўся, і да Даніила прыхіліў сэрца, каб
выратаваць яго, і намагаўся аж да заходу сонца вызваліць яго.
15 Тады тыя людзі пасьпяшаліся да валадара і сказалі валадару: «Ведай, валадару, што паводле
закону Мідзянаў і Пэрсаў ніякая забарона і пастанова, якая пастаноўленая валадаром, ня
могуць быць зьменены».
16 Тады валадар сказаў, і прывялі Даніила, і кінулі ў роў з ільвамі. Адказаў валадар і сказаў
Даніілу: «Бог твой, Якому ты заўжды служыш, няхай выратуе цябе».

17 І быў прынесены адзін камень, і быў паложаны на адтуліну рову, і валадар запячатаў яе
сыгнэтам сваім і сыгнэтам магнатаў сваіх, каб нічога не магло быць зьменена адносна Даніила.
18 Пасьля пайшоў валадар у палац свой і правёў ноч у посьце, і музычных інструмэнтаў не
прыносілі да яго, і сон ягоны адыйшоў ад яго.
19 Тады валадар устаў на золку і пасьпешліва пайшоў да рову з ільвамі.
20 І, падыйшоўшы да рову, ён крыкнуў голасам жалосным да Даніила. Адказаў валадар і сказаў
Даніілу: «Даніил, слуга Бога Жывога! Бог твой, Якому ты заўжды служыш, ці змог выратаваць
цябе ад ільвоў?»
21 Тады прамовіў Даніил да валадара: «Валадару, жыві на вякі!
22 Бог мой паслаў анёла Свайго і зачыніў пашчы ільвоў, і яны не пашкодзілі мне, бо нявіннасьць
перад Ім была знойдзена ў-ва мне, і табе, валадару, я не зрабіў шкоды».
23 Тады валадар моцна ўсьцешыўся і сказаў, каб вывелі Даніила з рову; і Даніил быў выцягнуты
з рову, і ніякага пашкоджаньня не знайшлі на ім, бо ён верыў у Бога свайго.
24 І сказаў валадар, і прывялі тых мужоў, якія абвінавацілі зласьліва Даніила, і кінулі ў роў з
ільвамі іх, сыноў іхніх і жонак іхніх; і не дасягнулі яны яшчэ дна рову, як схапілі іх ільвы і
патрушчылі ўсе косткі іхнія.
25 Тады Дарый валадар напісаў усім народам, плямёнам і мовам, якія жылі на ўсёй зямлі:
«Супакой ваш няхай памножыцца!
26 Ад мяне выдадзены загад, каб паўсюль, дзе ўлада валадарства майго, усе трымцелі і баяліся
перад Богам Даніила, бо Ён — Бог Жывы, Які існуе вечна, і валадарства Ягонае ня будзе
зьнішчана, і ўлада Ягоная ня мае канца.
27 Ён ратуе і вызваляе, і робіць і цуды ў небе і на зямлі, бо Ён выратаваў Даніила ад ільвоў».
28 І гэты Даніил меў поспех у [час] валадараньня Дарыя і валадараньня Кіра Пэрса.

Дан 7

1 У першы год Бэльшацара, валадара Бабілонскага, Даніил бачыў сон і відзеж галавы сваёй на
ложку сваім. Тады ён запісаў гэты сон і расказаў сутнасьць справы.
2 Адказаў Даніил і сказаў: «Я бачыў відзеж уначы. І вось, чатыры вятры нябесныя ўзбурылі
мора вялікае.
3 І чатыры вялізныя зьвяры выйшлі з мора, адрозныя адзін ад аднаго.
4 Першы — як леў, і ў яго арліныя крылы. Я бачыў, ажно крылы ягоныя былі адарваныя, і ён
быў падняты з зямлі, і пастаўлены на ногі, як чалавек, і сэрца чалавечае было дадзена яму.
5 І вось іншы зьвер, другі, падобны да мядзьведзя, быў пастаўлены з аднаго боку, і тры рабрыны
ў пашчы ягонай, між зубоў ягоных; і гэтак сказалі яму: “Устань, еш шмат мяса”.
6 Пасьля гэтага я бачыў, і вось яшчэ адзін, як леапард, у якога на хрыбце ягоным чатыры крылы
птушыныя; і чатыры галавы ў зьвера, і ўлада была дадзена яму.
7 Пасля гэтага я бачыў у відзежах начных, і вось зьвер чацьвёрты, жахлівы і жудасны, і дужы
надзвычайна; і ў яго зубы вялікія жалезныя; ён жэр і трушчыў, а рэшту таптаў нагамі сваімі. І
ён адрозьніваўся ад усіх зьвяроў, якія былі перад ім, і дзесяць рагоў у яго.
8 Я прыглядаўся, глядзеў на рогі, і вось, адзін рог малы вырас сярод іх, і тры першыя рогі былі
вырваны з карэньнем перад ім, і вось, вочы, як вочы чалавечыя, у рога гэтага і рот, які гаварыў
пра вялікія рэчы.
9 Я бачыў, аж былі пастаўлены пасады, і Старадаўні Днямі сеў; адзеньне Ягонае — белае як
сьнег, і валасы на галаве Ягонай — як воўна чыстая; пасад Ягоны — полымя агню, колы Ягоныя
— агонь палючы.
10 Рака агню выцякала і разьлівалася перад Ім; тысяча тысячаў служылі Яму, і дзесяць тысячаў
дзесяткаў тысячаў стаялі перад Ім. Суд сеў, і кнігі былі разгорнутыя.
11 Я бачыў тады, што з прычыны голасу словаў вялікіх, якія гаварыў рог, я бачыў, што зьвер
быў забіты, і зьнішчана цела ягонае, і аддадзена на спаленьне агню.
12 А ў рэшты зьвяроў была забрана ўлада іхняя, але працягласьць жыцьця іхняга дадзена ім да
[вызначанай] пары і часу.

13 Я бачыў у відзежах начных, і вось, з хмарамі нябеснымі нібы Сын Чалавечы надыходзіць, і
Ён прыйшоў да Старадаўняга Днямі, і Яго падвялі перад аблічча Ягонае.
14 І была дадзена Яму ўлада, слава і валадарства, каб усе народы, плямёны і мовы служылі
Яму. Улада Ягоная — улада вечная, якая не праміне, і валадарства Ягонае ня будзе зьнішчана.
15 І занепакоіўся дух мой у-ва мне, у Данііле, унутры цела [майго], і відзежы галавы маёй
устрывожылі мяне.
16 Я наблізіўся да аднаго з тых, што [там] стаялі, і спытаўся ў яго праўды пра ўсё гэта, і ён
сказаў мне, і паведаміў мне значэньне рэчаў гэтых.
17 "Гэтыя зьвяры вялікія, якіх чатыры, — гэта чатыры валадары, якія паўстануць з зямлі.
18 І атрымаюць валадарства сьвятыя Найвышэйшага і яны будуць трымаць валадарства вечна,
на вякі вечныя".
19 Тады я хацеў дазнацца пра зьвера чацьвёртага, які адрозьніваўся ад усіх іх, надзвычайна
жудасны, зубы ягоныя жалезныя і кіпцюры ягоныя мядзяныя, ён жэр і трушчыў, а рэшту
таптаў нагамі сваімі,
20 і пра дзесяць рагоў на галаве ягонай, і пра іншы [рог], які вырас і перад ім упалі тры, і пра рог
гэты, і вочы ягоныя, і рот, які гаварыў пра вялікія рэчы, і выгляд ягоны большы за супольнікаў
ягоных.
21 Я бачыў, і гэты рог вёў вайну са сьвятымі, і перамагаў іх,
22 пакуль не прыйшоў Старадаўні Днямі, і суд быў дадзены сьвятым Найвышэйшага, і
надыйшоў час [вызначаны], каб валадарства атрымалі сьвятыя.
23 Гэтак ён сказаў: "Зьвер чацьвёрты — гэта валадарства чацьвёртае, што будзе на зямлі; яно
адрознае ад усіх валадарстваў, і яно зжарэ ўсю зямлю, і стопча яе, і патрушчыць яе.
24 А дзесяць рагоў [значаць], што з гэтага валадарства паўстане дзесяць валадароў, а пасьля іх
паўстане адзін, і ён будзе адрозьнівацца ад іншых, і ён скіне трох валадароў.
25 І словы супраць Найвышэйшага ён будзе прамаўляць, і сьвятых Найвышэйшага будзе
ўціскаць, і задумае адмяніць сьвяты і закон, і яны будуць аддадзеныя ў руку ягоную да часу,
часоў і паловы часу.
26 І суд сядзе, і ўладу ягоную забяруць, каб выгубіць і зьнішчыць [яго] да канца.
27 Валадарства і ўлада і веліч валадарстваў пад усім небам будзе дадзена народу сьвятых
Найвышэйшага. Валадарства Ягонае — валадарства вечнае, і ўсе ўлады будуць служыць Яму і
будуць слухаць Яго".
28 Дагэтуль канец слова гэтага. Мяне, Данііла, думкі мае вельмі трывожылі, і выгляд мой
зьмяніўся ў мяне; але слова гэтае я захаваў у сэрцы маім».

Дан 8

1 «У трэці год валадараньня Бэльшацара валадара відзеж зьявіўся мне, мне, Даніілу, пасьля
таго, які зьявіўся мне спачатку.
2 І бачыў я ў відзежы, і сталася ў відзежы, што я ў Шушане сталіцы, якая ў краіне Элям, і я бачыў
у відзежы, і я быў каля ракі Улай.
3 І я ўзьняў вочы мае, і ўбачыў, і вось, адзін баран стаіць перад ракою, і ў яго рогі, і рогі гэтыя
высокія, і адзін вышэйшы за другі, і вышэйшы вырас пазьней.
4 Я бачыў, што баран гэты бадае на захад, і на поўнач, і на поўдзень, і ніякі зьвер ня можа
ўстаяць перад ім, і няма нікога, хто можа выратаваць з рукі ягонай. І ён рабіў, што падабалася
яму, і ўзьвялічыўся.
5 І калі я разважаў [пра гэта], вось, казёл з козаў ішоў з захаду па абліччы ўсёй зямлі і не
датыкаўся зямлі. І ў гэтага казла быў відзён рог паміж вачэй ягоных.
6 І ён прыйшоў да таго барана, які меў рогі, якога я бачыў, што ён стаіць перад ракою, і пабег
на яго ў шале сілы сваёй.
7 І я бачыў, што ён наблізіўся да барана, і разьярыўся на яго, і ўдарыў барана, і зламаў абодва
рогі ягоныя; і не было сілы ў барана ўстаяць супраць яго. І ён паваліў яго на зямлю, і патаптаў
яго; і не было нікога, хто б выратаваў барана з рукі ягонай.

8 А казёл з козаў узьвялічыўся вельмі. Але калі ён узмоцніўся, вялікі рог быў зламаны, і
вырасьлі падобныя чатыры замест яго на чатыры вятры нябесныя.
9 А з аднаго з іх выйшаў малы рог, і вырас надзвычайна на поўдзень і на ўсход, і да прыгожай
[зямлі].
10 І ён вырас аж да войска нябеснага, і скінуў на зямлю [некаторых] з таго войска і з зорак, і
патаптаў іх.
11 І нават да Князя войска гэтага вырас, і ад Яго была аддалена заўсёдная ахвяра, і пакінута
месца сьвятыні Ягонай.
12 І войска было аддадзена [яму] разам з ахвярай заўсёднай з прычыны правіны, і ён кінуў
праўду на зямлю, і дзейнічаў, і меў посьпех.
13 І я пачуў аднаго сьвятога, які прамаўляў, і сказаў іншы сьвяты да таго, які прамаўляў: “Як
доўга будзе [паказанае ў] відзежы пра заўсёдную ахвяру і правіну спусташэньня, [як доўга]
сьвятыня і войска будуць аддадзены на патаптаньне?”
14 І ён сказаў мне: “Ажно да дзьвюх тысячаў трыста вечароў і раніцаў; і будзе ачышчаная
сьвятыня”.
15 І сталася, калі я, Даніил, бачыў гэты відзеж і шукаў, каб зразумець [яго], вось, стаў перада
мною [нехта], падобны да мужа.
16 І я пачуў голас чалавечы пасярод Улаю, які ўсклікнуў і сказаў: “Габрыэлю! Дай зразумець
яму відзеж!”
17 І ён падыйшоў да месца майго, і калі ён прыйшоў, я спалохаўся і ўпаў на аблічча маё; і ён
сказаў мне: “Зразумей, сыне чалавечы, што пра час канца відзеж гэты”.
18 А калі ён прамаўляў да мяне, я быў у глыбокім сьне, [лежачы] абліччам маім на зямлі; і ён
дакрануўся да мяне, і паставіў мяне на месцы маім,
19 і сказаў: “Вось, я паведамляю табе, што будзе пры канцы абурэньня гэтага, бо ў
[вызначаным] часе [прыйдзе] канец.
20 Баран, якога ты бачыў, які мае рогі — гэта валадар Мідзянаў і Пэрсаў.
21 А казёл касматы — гэта валадар Явану; а рог вялікі, які паміж вачэй ягоных — гэта першы
валадар [Грэцыі].
22 А што ён зламіўся і замест яго паўсталі чатыры — гэта чатыры валадарствы, якія паўстануць
з [таго] народу, але бяз сілы ягонай.
23 А ў канцы валадарства іхняга, калі адступнікі скончаць [меру сваю], паўстане валадар з
нахабным абліччам і здольны ў падступнасьці.
24 І ўзмоцніцца сіла ягоная, але ня [ўласнаю] сілаю сваёй, і нечувана ён будзе нішчыць, і будзе
мець посьпех, і дзейнічаць, і зьнішчыць магутных і народ сьвятых.
25 І дзякуючы розуму ягонаму, будзе мець посьпех падман у руцэ ягонай, і ён узьвялічыцца ў
сэрцы сваім, і ў [часе] супакою зьнішчыць мноства. І ён паўстане супраць Князя князёў, але
не рукою [чалавечаю] будзе зломлены.
26 А відзеж пра вечар і раніцу, пра які сказана, — гэта праўда; але ты схавай гэты відзеж, бо
[споўніцца] ён праз шмат дзён”.
27 І я, Даніил, самлеў, і быў хворы [некалькі] дзён. І я ўстаў, і рабіў справы валадара; і я быў
уражаны відзежам, але ніхто гэтага не разумеў».

Дан 9

1 У першым годзе Дарыя, сына Ахашвэроша, з насеньня Мідзянаў, які валадарыў над
валадарствам Халдэйскім,
2 у першы год валадараньня ягонага, я, Даніил, зразумеў з кнігаў лік гадоў, пра якія было слова
ГОСПАДА да Ярэміі прарока, што маюць споўніцца семдзясят гадоў спусташэньню Ерусаліму.
3 І я зьвярнуў аблічча маё да Госпада Бога, каб шукаць [Яго] ў малітве і ў маленьнях, у посьце,
зрэбніцы і попеле.

4 І я маліўся да ГОСПАДА, Бога майго, і спавядаўся, і казаў: «Госпадзе, Божа вялікі і страшны,
Які захоўваеш запавет і міласэрнасьць да тых, якія любяць Цябе і захоўваюць прыказаньні
Твае!
5 Мы саграшылі і ўчынілі беззаконьне, і зрабілі нягодна, і збунтаваліся, і адступіліся ад
прыказаньняў Тваіх і ад судоў Тваіх.
6 І мы ня слухалі слугаў Тваіх, прарокаў, якія прамаўлялі ў імя Тваё да валадароў нашых,
князёў нашых, бацькоў нашых і да ўсяго народу зямлі.
7 У цябе, Госпадзе, праведнасьць, а ў нас на абліччах сорам, як у гэты дзень, у мужоў Юды, і ў
жыхароў Ерусаліму, і ў-ва ўсяго Ізраіля, блізкіх і далёкіх, у-ва ўсіх землях, куды Ты выгнаў іх
за здраду іхнюю, якой яны здрадзілі Табе.
8 ГОСПАДЗЕ, сорам на абліччах у нас, у валадароў нашых, у князёў нашых, у бацькоў нашых,
бо мы саграшылі супраць Цябе.
9 У Госпада, Бога нашага, літасьць і прабачэньне, хоць мы ўзбунтаваліся супраць Яго,
10 і ня слухалі голасу ГОСПАДА, Бога нашага, каб хадзіць паводле Законаў Ягоных, якія Ён даў
нам праз рукі слугаў Сваіх, прарокаў.
11 І ўвесь Ізраіль парушыў Закон Твой, і яны адвярнуліся, каб ня слухаць голасу Твайго.
І выліўся на нас праклён і прысяга, якія запісаныя ў Законе Майсея, слугі Божага, бо мы
саграшылі супраць Яго.
12 І Ён споўніў слова Сваё, якое прамовіў супраць нас і супраць судзьдзяў нашых, якія судзілі
нас, навёўшы на нас вялікае ліха, якое не рабілася пад усім небам і якое было ўчынена ў
Ерусаліме.
13 Як напісана ў Законе Майсея, так прыйшло на нас усё гэтае ліха; але мы не залагодзілі
аблічча ГОСПАДА, Бога нашага, адварочваючыся ад беззаконьня свайго і разумеючы праўду
Тваю.
14 І чуваў ГОСПАД над гэтым ліхам, і навёў яго на нас, бо праведны ГОСПАД, Бог наш, у-ва ўсіх
учынках Сваіх, якія Ён робіць, бо мы ня слухалі голас Ягоны.
15 І цяпер, Госпадзе, Божа наш, Які вывеў народ Твой з зямлі Эгіпецкай рукою моцнаю і зрабіў
Сабе імя, як у гэты дзень, мы саграшылі і ўчынілі беззаконьне.
16 Госпадзе! Паводле ўсёй праведнасьці Тваёй няхай адвернецца гнеў Твой і абурэньне Тваё
ад гораду Твайго Ерусаліму, сьвятой гары Тваёй, бо за грахі нашыя і за беззаконьні бацькоў
нашых Ерусалім і народ Твой у ганьбе ў-ва ўсіх, хто навокал нас.
17 І цяпер пачуй, Божа наш, малітву слугі Твайго і маленьне ягонае, і няхай зазьзяе аблічча
Тваё над сьвятыняй Тваёй, якая спустошана, дзеля [Цябе], Госпадзе!
18 Нахілі, Божа мой, вуха Тваё і пачуй! Адчыні вочы Твае і паглядзі на спусташэньне нашае
і на горад, які названы імем Тваім, бо не з прычыны праведнасьці нашай мы кладзем перад
абліччам Тваім маленьні нашыя, але з прычыны вялікай літасьці Тваёй.
19 Госпадзе, пачуй! Госпадзе, прабач! Госпадзе, прыхілі вуха і зрабі, не затрымлівайся дзеля
Сябе [Самога], Божа мой, бо імя Тваё названа над горадам Тваім і над народам Тваім».
20 І я яшчэ гаварыў і вызнаваў грэх мой і грэх народу майго Ізраіля, і складаў маленьне маё
перад абліччам ГОСПАДА, Бога майго, за сьвятую гару Бога майго.
21 І калі я яшчэ гаварыў у малітве, муж гэты, Габрыэль, якога я бачыў у відзежы раней,
сьпяшаючыся, пасьпяшаўся і дакрануўся да мяне ў часе вечаровай ахвяры хлебнай.
22 І ён даў мне разуменьне, і гаварыў са мной, і сказаў: «Даніі́ле, цяпер я выйшаў, каб навучыць
цябе разуменьню.
23 На пачатку маленьня твайго выйшла слова, і я прыйшоў распавесьці [яго], бо ты
найкаштоўнейшы. Дык разумей слова і зразумей відзеж.
24 Семдзясят тыдняў вызначана народу твайму і гораду сьвятому твайму, каб спыніць
правіну, і скончыць [меру] грэху, і адкупіць беззаконьне, і прывесьці праведнасьць вечную,
і запячатаць відзежы і прароцтвы, і памазаць Сьвятое Сьвятых.
25 Дык ведай і разумей: ад выхаду слова пра вяртаньне і адбудову Ерусаліму да Памазанца
Правадыра — сем тыдняў і шэсцьдзясят два тыдні, і вернецца [народ], і будзе адбудаваная

плошча і мур, але ў цяжкія часы.
26 І пасьля шасьцідзесяці двух тыдняў будзе забіты Памазанец, і ня будзе Яго, а горад і
сьвятыню зьнішчыць народ правадыра, які прыйдзе, і канец ягоны — як паводка, і аж да канца
вайны вызначана [быць] спусташэньням.
27 Ён зацьвердзіць запавет для многіх у адзін тыдзень, і ў палове тыдня спыніцца ахвяра
крывавая і ахвяра хлебная, і на крыле [сьвятыні] будзе агіда спусташэньня аж да канца, калі
вызначаны [прысуд] выльецца на спусташальніка».

Дан 10

1 У трэці год Кіра, валадара Пэрсаў, слова было адкрыта Даніілу, якога называлі імем
Бэльтэшацар; і слова гэтае — праўдзівае; і вайна вялікая; і ён зразумеў слова гэтае, і меў
разуменьне відзежу.
2 У тыя дні я, Даніил, быў у жалобе тры тыдні дзён.
3 Хлеба смачнага я ня еў, і мяса і віно не ўваходзілі ў вусны мае, і масьцямі я ня масьціў сябе,
пакуль ня споўніліся тры тыдні дзён.
4 І ў дваццаць чацьвёрты дзень першага месяца я быў на беразе ракі вялікай, гэта Хідэкель.
5 І ўзьняў я вочы мае, і глядзеў, і вось, адзін муж, апрануты ў ільняныя [шаты], і сьцёгны
ягоныя падперазаныя шчырым золатам з Уфазу.
6 А цела ягонае — як тапаз, і аблічча ягонае — як выгляд маланкі, і вочы ягоныя — як полымя
паходні, і рамёны ягоныя, і ногі ягоныя — колеру медзі блішчастай, а голас словаў ягоных —
голас мноства [людзей].
7 І толькі я, Даніил, бачыў гэты відзеж, а людзі, якія былі са мною, ня бачылі гэтага відзежу, але
страх вялікі ахапіў іх, і яны ўцяклі, каб схавацца.
8 І я застаўся адзін, і бачыў гэты відзеж вялікі, і ня стала сілы ў мяне, і велічнасьць мая
зьмянілася ў-ва мне і зьнікла, і не засталося сілы [ў мяне].
9 І я пачуў голас словаў ягоных; і калі я пачуў голас словаў ягоных, я самлеў у глыбокім сьне
на абліччы маім, і абліччам маім [ляжаў] на зямлі.
10 І вось, рука дакранулася да мяне і паставіла мяне на каленях маіх і на далонях рук маіх.
11 І ён сказаў мне: «Даніиле, муж найкаштоўнейшы, зразумей словы, якія я гавару табе, і стань
на месцы сваім, бо цяпер я пасланы да цябе». І калі ён гаварыў гэтае слова да мяне, я стаяў,
дрыжучы.
12 І ён сказаў мне: «Ня бойся, Даніиле, бо з першага дня, калі ты скіраваў сэрца тваё да
зразуменьня і ўпакоранасьці перад абліччам Бога твайго, былі пачутыя словы твае, і я
прыйшоў дзеля словаў тваіх.
13 Але князь валадарства Пэрсаў стаяў супраць мяне дваццаць адзін дзень; і вось Міхаэль, адзін
з першых князёў, прыйшоў дапамагчы мне, і я заставаўся там пры валадарах Пэрсаў.
14 І я прыйшоў даць табе зразумець, што адбудзецца з народам тваім у канцы дзён, бо відзеж
гэты [датычыць] тых дзён».
15 І калі ён гаварыў да мяне гэтыя словы, я схіліў аблічча маё да зямлі і зьнямеў.
16 І вось [нехта], падобны да сыноў чалавечых, дакрануўся да губаў маіх, і я адчыніў вусны
мае, і прамовіў, і сказаў таму, хто стаяў перада мною: «Пане мой, ад відзежу гэтага боль мой
напоўніў мяне, і не засталося сілы [ў мяне].
17 І як можа слуга пана майго гаварыць з гэтым панам маім? Бо цяпер няма сілы ў мяне, і
дыханьня не засталося ў-ва мне».
18 І зноў дакрануўся да мяне [нехта], падобны да чалавека і ўмацаваў мяне,
19 і сказаў: «Ня бойся, муж найкаштоўнейшы! Супакой табе! Будзь цьвёрды і будзь моцны!» І
калі ён гаварыў да мяне, я ўмацаваўся і сказаў: «Кажы, пане мой, бо ты ўмацаваў мяне».
20 І ён сказаў: «Ці ты ведаеш, чаму я прыйшоў да цябе? І цяпер я вярнуўся, каб ваяваць з князем
Пэрсіі. І я адыйду, і вось, прыйдзе князь Явану.
21 Але я распавяду табе, што напісана ў запісе праўды. І няма нікога, хто падтрымлівае мяне
ў гэтым [змаганьні], толькі Міхаэль, князь ваш.

Дан 11

1 І я ў першым годзе Дарыя Мідзяніна стаяў, каб умацаваць і падтрымаць яго.
2 І цяпер я распавяду табе праўду. Вось, паўстануць яшчэ тры валадары ў Пэрсіі, і чацьвёрты
ўзбагаціцца багацьцем сваім больш за ўсіх, і калі ён умацуецца ў багацьці сваім, ён узьніме
ўсіх супраць валадарства Явану.
3 І валадар магутны паўстане [там], які будзе панаваць панаваньнем вялікім і будзе рабіць тое,
што даспадобы яму.
4 Але калі ён паўстане, валадарства ягонае будзе зломлена і будзе падзеленае на чатыры вятры
нябесныя, і не паміж нашчадкамі ягонымі, і ня будзе [мець] тое панаваньне, якім ён панаваў,
бо будзе вырвана валадарства ягонае і [дадзена] іншым, а ня ім.
5 І ўмацуецца валадар з поўдня, але [адзін] з князёў ягоных будзе мацнейшым за яго і запануе,
і панаваньне тое будзе большым за панаваньне ягонае.
6 Але пасьля заканчэньня [некалькіх] гадоў яны злучацца, і дачка валадара з поўдня прыйдзе
да валадара з поўначы, каб зрабіць паводле справядлівасьці; але яна не захавае сілы рамёнаў
[сваіх], і не ўстаіць рамяно ейнае, і будзе выдадзена яна, і тыя, якія прывялі яе, і той, якога яна
нарадзіла, і той, які ўмацоўваў яе ў тыя часы.
7 І паўстане парастак з кораня ейнага на месца сваё, і выйдзе супраць войска, і ўвойдзе ў
цьвярдыню валадара з поўначы, і будзе дзейнічаць супраць яго, і ўмацуецца.
8 І таксама багоў іхніх з літымі выявамі іхнімі, з начыньнем іхнім каштоўным, срэбным і
залатым, завязе ў палон у Эгіпет; і ён [некалькі] гадоў будзе стаяць [вышэй], чым валадар
з поўначы.
9 Хоць той прыйдзе ў валадарства валадара з поўдня, але вернецца ў зямлю сваю.
10 Але сыны ягоныя ўзброяцца і зьбяруць мноства войска вялікага, і [адзін], ідучы, пойдзе, і
залье [ўсё], і пройдзе [паўсюль], і вернецца, і будзе змагацца супраць цьвярдыні ягонай.
11 І раззлуецца валадар з поўдня, і вырушыць [на вайну], і будзе ваяваць з ім, з валадаром з
поўначы, і [той] выставіць мноства вялікае, але мноства гэтае будзе аддадзена ў руку ягоную.
12 І будзе зьнішчана гэтае мноства, і ўзьнімецца сэрца ягонае, і хоць ён кіне [на зямлю] дзясяткі
тысячаў, ён не ўмацуецца.
13 І вернецца валадар з поўначы, і выставіць мноства, большае за ранейшае, і ў канцы часоў і
гадоў, ідучы, прыйдзе з войскам вялікім і з маёмасьцю шматлікай.
14 І ў тыя часы шмат паўстане супраць валадара з поўдня, і сыны гвалту ў народзе тваім
падымуцца, каб споўніўся відзеж, і яны спатыкнуцца.
15 І прыйдзе валадар з поўначы, і насыпле вал, і здабудзе горад умацаваны, і рамёны поўдня
не ўстаяць, народ выборны ягоны і ён ня будуць мець сілы, каб устаяць.
16 І той, які прыйдзе супраць яго, будзе рабіць паводле ўпадабаньня свайго, і ня будзе таго, хто
супрацівіцца яму; і ён стане ў зямлі прыгожай, і загуба ў руцэ ягонай.
17 І ён зьверне аблічча сваё, каб прыйсьці з моцаю ўсяго валадарства свайго, і зробіць з ім
угоду; і дасьць яму дачку жанчынаў, каб зьнішчыць яго, але ня станецца [так] і яна ня будзе з
ім.
18 І, зьвяртаючы, ён зьверне аблічча сваё да астравоў, і здабудзе [іх]; але правадыр спыніць
ганьбу, [зробленую ім], і зьверне ганьбу ягоную на яго самога.
19 І ён зьверне аблічча сваё да цьвярдыняў зямлі сваёй, і спатыкнецца, і ўпадзе, і ня знойдуць
[яго].
20 І паўстане на месца ягонае той, які пашле прыгнятальніка ў славе валадарства, але праз
некалькі дзён будзе зломлены, і не ад гневу, і ня ў бітве.
21 І паўстане на месца ягонае пагарджаны, і не дадуць яму годнасьці валадарскай; але ён
прыйдзе ціха і ўмацуе валадарства подступам.
22 І рамёны [сілы ягонай], як паводкаю, будуць залітыя перад абліччам ягоным і будуць
зломленыя, і таксама начальнік, [які заключыў] запавет.
23 Бо, злучыўшыся з ім, ён будзе дзейнічаць ашуканствам, і ён узыйдзе, і ўмацуецца з
[дапамогай] малога народу.

24 У [часе] супакою ён прыйдзе ва ўрадлівыя месцы краю і зробіць тое, чаго не рабілі бацькі
ягоныя і бацькі бацькоў ягоных. Нарабаванае, здабычу і маёмасьць прынясе сваім, і пра
[здабыцьцё] цьвярдыняў задумае думкі свае, але да часу.
25 І ён узбудзіць сілу сваю і сэрца сваё на валадара з поўдня з войскам вялікім, і валадар
з поўдня ўзброіць на бітву войска вялікае і вельмі магутнае, але не ўстаіць, бо задумаюць
супраць яго думкі [здрадлівыя].
26 І тыя, якія ядуць ежу ягоную, зломяць яго, і войска ягонае разальецца, і ўпадзе шмат забітых.
27 І сэрцы абодвух гэтых валадароў будуць рабіць ліха, і яны будуць гаварыць хлусьню за
адным сталом, і ня будуць мець посьпеху, бо яшчэ не канец вызначанаму часу.
28 І вернецца ён у зямлю сваю з багацьцем вялікім, а сэрца ягонае [будзе] супраць запавету
сьвятога, і ён зробіць [намер свой], і вернецца ў зямлю сваю.
29 У вызначаным часе ён вернецца і пойдзе на поўдзень; і ня будзе так, як раней і як пазьней.
30 І прыйдуць супраць яго караблі Кіттыму, і ён спалохаецца, і вернецца, і загневаецца на
запавет сьвяты; і зробіць [намер свой], і вернецца, і будзе мець паразуменьне з тымі, якія
пакінулі запавет сьвяты.
31 І паўстануць рамёны ягоныя, і апаганяць сьвятыню, цьвярдыню гэтую, і спыняць заўсёдныя
ахвяры, і паставяць агіду спусташэньня.
32 А тых, якія нягодна ставяцца да запавету, ён разбэсьціць лісьлівасьцю, але народ, які ведае
Бога свайго, умацуецца і будзе дзейнічаць.
33 І разумныя з народу дадуць разуменьне шматлікім, і будуць спатыкацца ад мяча і ад
полымя, ад палону і ад рабаваньня [шмат] дзён.
34 І, калі яны спатыкнуцца, яны атрымаюць малую дапамогу. І далучыцца да іх шмат хто
няшчыра.
35 І [некаторыя] з тых разумных спатыкнуцца, каб выпрабаваць іх і ачысьціць, і выбяліць аж
да часу канца, бо яшчэ ня час, які вызначаны.
36 І будзе валадар рабіць [намер свой], і вывышацца, і ўзьвялічвацца па-над кожным богам
паводле ўпадабаньня свайго. І супраць Бога багоў будзе гаварыць нечуваныя рэчы, і будзе
мець посьпех, пакуль ня зьдзейсьніцца абурэньне, бо тое, што вызначана, станецца.
37 І на багоў бацькоў сваіх ён ня будзе зважаць, ані на каштоўнасьці жанчынаў, і на ўсіх багоў
ён ня будзе зважаць, бо ўзьвялічыцца па-над усімі.
38 Але бога цьвярдыняў на месцы ягоным ён будзе ўшаноўваць, і бога, якога ня ведалі бацькі
ягоныя, ён будзе ўшаноўваць золатам і срэбрам, і дарагімі камянямі і каштоўнымі, і рэчамі
найкаштоўнейшымі.
39 І ён учыніць [вайну] з умацаванымі цьвярдынямі з [дапамогай] бога чужога. Тым, якія
прызнаюць яго, ён памножыць славу, і дасьць панаваньне над шматлікімі, і падзеліць грунты
як плату.
40 Але ў часе канца ўдарыць яго валадар з поўдня, і кінецца на яго валадар з поўначы з
калясьніцамі і вершнікамі, і з караблямі шматлікімі, і ўвойдзе ў зямлю [поўдня], і залье [яе],
і пяройдзе [яе].
41 І прыйдзе ён у зямлю прыгожую, і шмат хто спатыкнецца; але ўцякуць ад рукі ягонай Эдом,
і Мааў, і галоўныя з сыноў Амона.
42 І ён выцягне руку сваю на зямлю [поўдня], і зямля Эгіпецкая не ўцячэ.
43 І ён будзе панаваць над скарбамі залатымі і срэбнымі і над усімі каштоўнасьцямі Эгіпту; і
Лібійцы, і Кушане пойдуць за ім.
44 Але весткі з усходу і поўначы напалохаюць яго, і ён пойдзе ў гневе вялікім, каб зьнішчыць і
аддаць закляцьцю шмат каго.
45 І ён паставіць намёты палацу свайго паміж мораў і гарой прыгажосьці Сьвятой, і прыйдзе
да канца свайго, і ня будзе таго, хто дапаможа яму.

Дан 12

1 І ў той час паўстане Міхаэль, князь вялікі, які стаіць пры сынах народу твайго; і будзе час

нядолі, якога не было ад таго [часу], як існуе народ, аж да гэтага часу; і ў гэты час уцячэ [ад
загубы] народ твой, кожны, хто будзе знойдзены запісаным у кнізе.
2 І шмат тых, якія сьпяць у пыле зямлі, абудзяцца, адны — да жыцьця вечнага, а іншыя — на
ганьбу, на грэбаваньне вечнае.
3 І разумныя будуць зьзяць як сьвяцілы на прасьцягу [неба], і тыя, якія прывялі да праведнасьці
шматлікіх — як зоркі, на вякі вечныя.
4 А ты, Даніі́ле, замкні словы гэтыя і запячатай кнігу аж да часу канца. Шмат хто будзе
кружляць [па ёй], і памножыцца веданьне».
5 І паглядзеў я, Даніі́л, і вось, іншыя два [мужы] стаяць, адзін — на гэтым беразе ракі, а другі
— на тым беразе ракі.
6 І я сказаў мужу, апранутаму ў ільняныя [шаты], які [быў] над водамі ракі: «Калі [будзе] канец
гэтым цудоўным [рэчам]?»
7 І я пачуў мужа, апранутага ў ільняныя [шаты], які [быў] над водамі ракі. І ён падняў правіцу
сваю і лявіцу сваю да неба, і прысягнуў на Таго, Які жыве вечна, што [міне] час вызначаны,
часы і палова [вызначанага часу], і калі скончыцца разьбіваньне [сілы] рукі народу сьвятога,
тады зьдзейсьніцца ўсё гэта.
8 І я пачуў, але не зразумеў, і я сказаў: «Пане мой! Які канец гэтага [ўсяго]?»
9 І ён сказаў: «Ідзі, Даніі́ле, бо замкнёныя і запячатаныя словы гэтыя аж да часу канца.
10 Будуць ачышчаныя і выбеленыя, і выспрабаваныя шматлікія, і бязбожнікі будуць рабіць
бязбожна, і не зразумее гэтага ніхто з бязбожнікаў, а разумныя зразумеюць.
11 І ад часу, калі будзе спынена заўсёдная ахвяра і пастаўленая агіда спусташэньня, [міне]
тысяча дзьвесьце дзевяноста дзён.
12 Шчасьлівы той, хто чакае і дасягне тысяча трыццаці пяці дзён.
13 А ты ідзі да канца, і супачынеш, і паўстанеш для [атрыманьня] часткі сваёй у канцы дзён».

КНІГА ПРАРОКА ОСІІ

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Осіі, сына Бээры, у дні Узіі, Ёатама, Ахаза, Эзэкіі, валадароў
Юды, і ў дні Ерабаама, сына Ёаша, валадара Ізраіля.
2 Пачатак слова ГОСПАДА праз Осію. І сказаў ГОСПАД да Осіі: «Ідзі, вазьмі сабе жанчыну
распусную і дзяцей распусты. Бо распустаю распусьнічае зямля гэтая перад ГОСПАДАМ».
3 І ён пайшоў, і ўзяў [за жонку] Гомэр, дачку Дыблаіма, і яна зачала, і нарадзіла яму сына.
4 І сказаў ГОСПАД да яго: «Назаві імя ягонае Езрээль, бо яшчэ трохі, і Я наведаю за кроў Езрээля
дом Егу і спыню валадарства дому Ізраіля.
5 І станецца ў той дзень, што Я зламлю лук Ізраіля ў даліне Езрээль».
6 І зачала яна зноў, і нарадзіла дачку. І сказаў [Госпад] да яго:«Назаві імя ейнае Лё-Рухама, бо
ўжо не зьяўлю міласьці над домам Ізраіля, бо, узьнімаючыся, узьнімуся супраць яго.
7 Але дому Юды зьяўлю міласьць і збаўлю іх праз ГОСПАДА, Бога іхняга, але ня збаўлю іх ані
лукам, ані мячом, ані вайною, ані канямі, ані вершнікамі».
8 І адлучыла ад грудзей Лё-Рухаму, і зачала, і нарадзіла сына.
9 І сказаў [Госпад]: «Назаві імя ягонае Лё-Аммі, бо вы — не народ Мой, і Я ня буду [Богам]
вашым».
10 І будзе лік сыноў Ізраіля як пясок марскі, якога нельга ані памераць, ані палічыць. І
станецца, што ў месцы, у якім было сказана ім: «Вы — не народ Мой», будзе сказана ім: «Вы
— сыны Бога Жывога».
11 І зьбяруцца сыны Юды і сыны Ізраіля разам, і паставяць сабе адну галаву, і ўздымуцца з
зямлі, бо вялікі дзень Езрээля.

Ос 2

1 Кажыце братам вашым: «Народ Мой», і сёстрам вашым: «Памілаваная».
2 Спрачайцеся з маці вашай, спрачайцеся, бо яна — ня жонка Мая, а Я — ня муж ейны. Няхай
яна прыбярэ распусту сваю з аблічча, і чужалоства сваё — спасярод грудзей сваіх.
3 Іначай распрану яе дагала і пастаўлю яе, як яна была ў дзень нараджэньня свайго, і зраблю
яе як пустыню, і зраблю яе як зямлю сухую, і спрычыню сьмерць ёй ад смагі.
4 І не зьяўлю міласьці сынам ейным, бо яны — сыны распусты.
5 Бо маці іхняя чыніла распусту, чыніла сорам тая, што зачала іх, бо казала: «Пайду за
палюбоўнікамі маімі, якія даюць хлеб мой і воду маю, воўну маю і лён мой, алей мой і напой
мой».
6 Дзеля гэтага Я загараджу шлях твой цернямі і абгараджу цябе агароджаю, і ня знойдзе яна
сьцежак сваіх.
7 І будзе бегаць яна за палюбоўнікамі сваімі, але не дагоніць іх, і будзе шукаць іх, і ня знойдзе.
І скажа: «Пайду і вярнуся да першага мужа майго, бо тады лепш мне было, чым цяпер».
8 І яна ня ведае, што гэта Я даваў ёй збожжа і сок, і сьвежы алей, і памножыў ёй срэбра і золата,
якое яны ўжывалі для Баала.
9 Дзеля гэтага вярнуся і забяру збожжа Маё ў часе яго, і [вінаградны] сок Мой у часе яго, і
забяру воўну Маю і лён Мой, якія былі прыкрыцьцём голасьці яе.
10 І цяпер Я адкрыю сорам ейны на вачах палюбоўнікаў ейных, і ніхто ня выратуе яе з рукі
Маёй.
11 І спыню ўсю радасьць яе, і сьвяты яе, і маладзікі яе, і суботы яе, і ўсе ўрачыстасьці яе.
12 І спустошу вінаграднікі яе і фігавыя дрэвы яе, пра якія яна казала: «Гэта плата мая, якую
далі мне палюбоўнікі мае». А Я зраблю іх лесам, і пажаруць іх зьвяры палявыя.
13 І Я наведаю яе за дні Баалаў, для якіх яна кадзіла, і аздаблялася завушніцамі сваімі і
кляйнотамі сваімі, і хадзіла за палюбоўнікамі сваімі, а пра Мяне забылася, кажа ГОСПАД.
14 Дзеля гэтага Я заваблю яе, і завяду ў пустыню, і буду прамаўляць да сэрца ейнага.
15 І дам ёй там вінаграднікі ейныя і даліну Ахор як браму надзеі. І яна адкажа там, як у дні
маладосьці сваёй, як у дзень выхаду яе з зямлі Эгіпецкай.

16 І станецца ў той дзень, кажа ГОСПАД, ты назавеш [Мяне]: «Муж мой», і ня будзеш больш называць Мяне: «Баал мой».
17 І Я прыбяру імёны Баалаў з вуснаў яе, і яна ня будзе ўзгадваць больш імёнаў іхніх.
18 І Я заключу для іх запавет у той дзень са зьвярамі палявымі і птушкамі нябеснымі, і з тымі, што поўзаюць па зямлі. І лук, і меч, і вайну зьнішчу з зямлі, і палажу іх бясьпечна.
19 І Я заручуся з табою на вякі, і заручуся з табою ў праведнасьці, у судзе, у міласэрнасьці і ў літасьці.
20 І заручуся з табою ў вернасьці, і ты пазнаеш ГОСПАДА.
21 І станецца ў той дзень, Я адкажу, кажа ГОСПАД, Я адкажу нябёсам, а яны адкажуць зямлі.
22 І зямля адкажа збожжу, [вінаграднаму] соку і сьвежаму алею, а яны адкажуць Езрээлю.
23 І Я засею яе для Сябе на зямлі, і зьлітуюся над Лё-Рухамой, і скажу Лё-Аммі: «Ты — народ Мой!», а ён скажа: «Бог мой!»

Ос 3

1 І сказаў ГОСПАД мне зноў: «Ідзі, пакахай жанчыну, якую кахае іншы і якая чужаложыць, як ГОСПАД любіць сыноў Ізраіля, а яны зьвяртаюцца да іншых багоў і любяць разынкі вінаградныя».
2 І я набыў яе для сябе за пятнаццаць срэбнікаў і паўтары гомары ячменю.
3 І сказаў ёй: «Шмат дзён будзеш жыць са мною. Ня будзеш займацца распустай і ня будзеш [належаць] іншаму мужу, і я таксама буду для цябе».
4 Бо шмат дзён будуць сыны Ізраіля жыць без валадара, і бяз князя, і без ахвяры, і без слупа, і без эфоду, і без тэрафімаў.
5 Потым навернуцца сыны Ізраіля і будуць шукаць ГОСПАДА, Бога свайго, і Давіда, валадара свайго, і будуць баяцца ГОСПАДА і добрасьці Ягонай у апошнія дні.

Ос 4

1 Слухайце слова ГОСПАДА, сыны Ізраіля, бо ГОСПАД мае спрэчку з жыхарамі зямлі гэтай, бо няма праўды і няма міласэрнасьці, і няма веданьня Бога на зямлі.
2 Праклён і хлусьня, і забойства, і крадзеж, і чужалоства памнажаюцца, і кроў даганяе кроў.
3 Дзеля гэтага лямантуе зямля і марнее ўсё, што жыве на ёй, зьвяры палявыя і птушкі нябесныя, і таксама рыбы марскія будуць сабраныя.
4 Але няхай ніхто не спрачаецца і ня ганіць іншага, бо народ твой — як той, хто спрачаецца са сьвятаром.
5 І ты спатыкнешся ўдзень, і прарок спатыкнецца з табою ўначы, і Я зьнішчу маці тваю.
6 Зьнішчаны народ Мой, бо няма веданьня. За тое, што ты адкінуў веданьне, і Я адкіну цябе ад сьвятарства Майго. І як ты забыўся пра Закон Бога твайго, і Я таксама забудуся пра сыноў тваіх.
7 Чым больш яны памножыліся, тым больш грашылі супраць Мяне. [Дзеля гэтага] славу іхнюю Я замяню ў ганьбу.
8 Яны ядуць грэх народу Майго, і да беззаконьняў іхніх імкнецца душа іхняя.
9 І будзе як з народам, так і са сьвятаром, і Я пакараю яго за шляхі ягоныя, і ўчынкі ягоныя зьвярну на яго.
10 І будуць есьці, і не насыцяцца, будуць чыніць распусту, і не разрастуцца, бо пакінулі зважаць на ГОСПАДА.
11 Распуста і віно, і сок забіраюць сэрца.
12 Народ Мой пытаецца ў дрэва свайго, і кій ягоны адказвае яму, бо дух распусты зьвёў у аблуду [яго], і яны чыняць распусту, [адступаючы] ад Бога свайго.
13 На вяршынях гор складаюць ахвяры і на ўзгорках паляць кадзіла пад дубам, таполяй і тэрэбінтам, бо добры цень іхні. Дзеля гэтага чыняць распусту дочкі вашыя, і нявесткі вашыя чужаложаць.

14 Ня буду караць дочак вашых, што чыняць распусту, і нявестак вашых, што чужаложаць, бо
вы аддзяляецеся з распусьніцамі і складаеце ахвяры з блудніцамі, і народ не разумее, што
ўпадзе.
15 Калі распусьнічаеш ты, Ізраіль, няхай Юда ня будзе вінаваты. Не ідзіце ў Гільгал, і не
прыходзьце ў Бэт-Авэн, і не прысягайце: «Жыве ГОСПАД!»
16 Бо Ізраіль наравісты, як наравістая цялушка. Цяпер ГОСПАД будзе пасьвіць іх як ягнятка на
вольным прасторы.
17 Далучыўся да ідалаў Эфраім. Пакінь яго.
18 Кіслы напой іхні, яны распустаю распусьнічаюць, палюбілі сорам абаронцы іхнія.
19 Падхопіць іх вецер крыламі сваімі, і будуць яны асаромленыя ахвярамі сваімі.

Ос 5

1 Слухайце гэта, сьвятары, і пачуйце, доме Ізраіля, і прыхіліце вуха, доме валадара, бо вам
будзе суд, бо вы былі пасткаю для Міцпы і сеткаю, расьцягнутаю на Таборы.
2 І бунтаўнікі жадаюць забіваць, але Я пакараю кожнага з іх.
3 Я ведаю Эфраіма, і Ізраіль не схаваны ад Мяне, бо цяпер ты распусьнічаеш, Эфраім, стаў
нячыстым Ізраіль.
4 Не даюць учынкі іхнія вярнуцца да Бога іхняга, бо дух распусты ў нутры іхнім, і яны ня
ведаюць ГОСПАДА.
5 І пыха Ізраіля сьведчыць перад абліччам ягоным, і Ізраіль, і Эфраім спатыкнуцца ў грахах
сваіх, таксама Юда спатыкнецца з імі.
6 З авечкамі сваімі, з валамі сваімі пойдуць шукаць ГОСПАДА, але ня знойдуць. Ён аддаліўся
ад іх.
7 Яны здрадзілі ГОСПАДУ, бо сыноў чужых нарадзілі. Цяпер пажарэ іх маладзік разам з
часткамі [спадчыны] іхняй.
8 Трубіце ў рог у Гіве, [дзьміце] ў трубу ў Раме, крычыце ў Бэт-Авэне: «Ужо па табе, Бэн'яміне!»
9 Эфраім будзе спустошаны ў дзень пакараньня. Сярод каленаў Ізраіля паведамлю пра тое,
што напэўна [будзе].
10 Князі Юды сталіся як тыя, што перасоўваюць мяжу. Выльлю на іх як ваду гнеў Мой.
11 Эфраім прыгнечаны, судом паламаны, бо пачаў хадзіць за марнотаю.
12 І Я [буду] як моль для Эфраіма, і як гніль для дому Юды.
13 І ўбачыў Эфраім хваробу сваю, а Юда — рану сваю, і пайшоў Эфраім у Асур, і паслаў да
валадара Ярэва, але той ня можа ані аздаравіць вас, ані вылечыць рану вашую.
14 Бо Я [буду] як леў для Эфраіма і як ільвяня для дому Юды. Я, Я разьдзяру і адыйду, панясу,
і ніхто не выратуе.
15 Пайду, вярнуся на месца Маё, аж пакуль не прызнаюць віну сваю і будуць шукаць аблічча
Маё. У прыгнечанасьці сваёй будуць пільна шукаць Мяне.

Ос 6

1 «Хадзем і вернемся да ГОСПАДА, бо Ён разьдзёр, і Ён нас аздаровіць, Ён ударыў, і Ён перавяжа
[раны] нашыя.
2 Ажывіць нас праз два дні, і на трэці дзень падніме нас, і мы будзем жыць перад абліччам
Ягоным.
3 І мы пазнаем, і будзем імкнуцца пазнаць ГОСПАДА. Як [прыход] раніцы падрыхтаваны выхад
Ягоны, і Ён прыйдзе да нас як дождж, як раньні дождж і як позьні дождж на зямлю».
4 Што Мне зрабіць табе, Эфраіме? Што Мне зрабіць табе, Юда? Міласэрнасьць вашая як воблака
ранішняе, як раса, што рана зьнікае.
5 Дзеля гэтага Я абчэсваў іх праз прарокаў, забіваў іх словамі вуснаў Маіх. І суды Мае як сьвятло
выходзяць.
6 Бо міласэрнасьці хачу, а не ахвяры, і пазнаньня Бога больш, чым цэласпаленьняў.
7 Але яны, як Адам, парушылі запавет, там яны здрадзілі Мне.
8 Гілеад — горад тых, якія робяць злачынствы, заплямлены крывёю.

9 Як разбойнікі цікуюць на чалавека, так хеўра сьвятароў забівае злачынна на шляху ў Сыхем,
бо яны падступнае ўчыняюць.
10 У доме Ізраіля Я бачыў брыдоту брыдотаў, там распуста Эфраіма, зганьбаваны Ізраіль.
11 Таксама для цябе, Юда, прызначана жніво, калі Я вярну палонных народу Майго.

Ос 7

1 Калі Я лячу Ізраіля, выяўляецца беззаконьне Эфраіма і ліхота Самарыі, бо яны ўчыняюць
хлусьню, і злодзей уваходзіць [у дом], разбойнікі рабуюць на вуліцы.
2 І ня кажуць яны ў сэрцы сваім, што Я памятаю пра ўсю ліхоту іхнюю. Цяпер атачаюць іх
учынкі іхнія, яны будуць перад абліччам Маім.
3 Ліхоцьцем сваім весялілі валадара, і маной сваёю — князёў.
4 Усе яны чужаложаць, як печ, распаленая пекарам, які перастае чуваць, калі замясіў цеста,
каб яно закісла.
5 У дзень валадара нашага князі зрабілі яго нядужым, [даўшы] бутлі віна, і ён выцягвае руку
сваю разам з насьмешнікамі.
6 Бо яны наблізілі сэрца сваё да [растаўляньня] пастак як [распаленая] печ. Пекар іхні сьпіць
усю ноч, а раніцаю яна гарыць, як полымя агню.
7 Усе яны распаленыя, як печ, і зьядаюць судзьдзяў сваіх. Усе валадары іхнія падаюць, няма
сярод іх нікога, хто б клікаў да Мяне.
8 Эфраім зьмяшаўся з народамі; Эфраім стаўся як аладка, [якая сьпечана], не пераварочваючы.
9 Чужынцы зьядаюць сілу ягоную, а ён ня ведае; таксама сівізна пабяліла яго, а ён ня ведае.
10 І сьведчыць пыха Ізраіля супраць яго, але яны не зьвяртаюцца да ГОСПАДА, Бога іхняга, і не
шукаюць Яго ў-ва ўсім гэтым.
11 І стаўся Эфраім як голуб дурны, бяз сэрца, клічуць Эгіпет, ідуць у Асірыю.
12 Калі яны пойдуць, Я расьцягну на іх сеці Мае, сьцягну іх, як птушак нябесных, пакараю іх,
як было ім сказана ў грамадзе іхняй.
13 Гора ім, бо яны ўцякаюць ад Мяне! Спусташэньне на іх, бо яны адступіліся ад Мяне! Хоць Я
адкупіў іх, яны кажуць няпраўду на Мяне.
14 І ня клічуць Мяне ў сэрцы сваім, калі выюць на ложках сваіх. Дзеля збожжа і віна яны
зьбіраюцца, але ад Мяне адварочваюцца.
15 Хоць Я настаўляў іх, умацоўваў рамёны іхнія, яны надумваюць ліхое супраць Мяне.
16 Зьвяртаюцца, але не да Найвышэйшага. Яны — як лук здрадлівы. Упадуць ад мяча князі
іхнія за ярасьць языка іхняга. Гэта [зробіць] іх пасьмешышчам у зямлі Эгіпецкай.

Ос 8

1 Трубу [паднясі] да вуснаў тваіх! Як арол [наляціць] на Дом ГОСПАДА, бо яны парушылі
запавет Мой і ад Закону Майго адступіліся.
2 Да Мяне клікалі: «Божа мой, мы ведаем Цябе, мы, Ізраіль!»
3 Адкінуў Ізраіль дабро. Вораг будзе перасьледаваць яго.
4 Яны ставяць валадароў, але без Мяне; ставяць князёў, але Я ня ведаю [пра гэта]. Са срэбра
свайго і золата свайго зрабілі ідалаў для сябе на загубу сваю.
5 Адкіне [іх] цяля тваё, Самарыя! Распаліўся гнеў Мой супраць іх. Як доўга ня будзеце
захоўваць нявіннасьць?
6 Бо і яно з Ізраіля; разьбяр зрабіў яго, і яно ня ёсьць богам, на кавалкі разваліцца цяля Самарыі.
7 Бо яны пасеялі вецер, і пажнуць буру. Ня будзе ў яго збожжа; парастак ня дасьць мукі, а калі
і дасьць, чужынцы праглынуць яе.
8 Праглынуты Ізраіль; ён стаўся між народамі як начыньне непатрэбнае.
9 Бо яны зыйшлі да Асура, як дзікі асёл самотны; Эфраім наймае сабе каханкаў.
10 Хоць яны наймалі ў народаў, цяпер Я зьбяру іх, і яны адчуюць крыху цяжар валадара князёў,
11 бо Эфраім намножыў ахвярнікі, каб грашыць, былі ў яго ахвярнікі, каб грашыць.
12 Пішучы, напісаў Я для яго найвялікшыя рэчы Закону Майго, але яны за чужое палічылі гэта.

13 Як ахвяры з дароў Маіх ахвяруюць мяса і ядуць яго, але ГОСПАД ня мае ўпадабаньня ў іх.
Цяпер Ён узгадае беззаконьне іхняе і наведае грахі іхнія; яны вернуцца ў Эгіпет.
14 І забыўся Ізраіль пра Творцу свайго, і пабудаваў сьвятыні; і Юда памножыў гарады
ўмацаваныя, але Я пашлю агонь на гарады ягоныя, і ён пажарэ замкі ягоныя.

Ос 9

1 Не весяліся, Ізраіль, ня радуйся, як іншыя народы, бо ты распусьнічаеш супраць Бога твайго,
ты палюбіў плату [распусьніцы] на кожным току збожжа.
2 Ток і тоўчня ня будуць жывіць іх, і віно ашукае іх.
3 Ня будуць яны жыць у зямлі ГОСПАДА, і вернецца Эфраім у Эгіпет, і ў Асірыі яны будуць есьці
нячыстае.
4 Ня будуць яны выліваць віно для ГОСПАДА, і ня будуць Яму прыемныя ахвяры іхнія. [Гэта]
будзе для іх як хлеб жалобы; усе, хто будуць есьці яго, будуць нячыстыя. Бо хлеб іхні за душы
іхнія ня ўвойдзе ў Дом ГОСПАДА.
5 Што будзеце рабіць у дзень сходу і ў дзень сьвята ГОСПАДА?
6 Бо вось, прыйдуць яны з прычыны зьнішчэньня. Эгіпет зьбярэ іх, Мэмфіс іх пахавае,
каштоўнае срэбра іхняе атрымае ў спадчыну крапіва, церні будуць у намётах іхніх.
7 Прыйдуць дні наведваньня, прыйдуць дні адплаты. Ізраіль даведаецца, што прарок здурнеў,
і ашалеў чалавек духа з прычыны мноства беззаконьня твайго і вялікай варожасьці [да Бога].
8 Прарок, [які быў] вартаўніком Эфраіма пры Богу маім, [стаўся] пасткай птушкалова на ўсіх
шляхах ягоных; варожасьць у доме бога ягонага.
9 Сапсуліся да глыбіні, як у дні Гівы. [Бог] будзе памятаць пра беззаконьне іхняе, пакарае за
грахі іхнія.
10 Я знайшоў Ізраіля як вінаград у пустыні, як першую фігу на дрэве фігавым на пачатку
[ўраджаю] яго Я ўбачыў бацькоў вашых. Але яны прыйшлі да Баал-Пэора і прысьвяцілі сябе
сораму, і былі агіднымі ў тым, што яны любілі.
11 Слава Эфраіма, як птушка, адляцела; [ня будзе] ані нараджэньня, ані ўлоньня, ані зачацьця.
12 Бо нават калі выгадуюць сыноў сваіх, Я забяру ў іх чалавека. Гора ім, бо Я адступлюся ад іх!
13 Эфраім, як Я бачыў, [падобны] да Тыру, пасаджаны на месцы прыемным, але Эфраім вядзе
на забіцьцё сыноў сваіх.
14 «Дай ім, ГОСПАДЗЕ, што хочаш даць! Дай ім улоньне бясплоднае і грудзі ссохлыя!»
15 Уся нягоднасьць іхняя ў Гільгале, бо там Я зьненавідзеў іх. З прычыны ліхоты ўчынкаў іхніх
выганю іх з Дому Майго, ня буду больш любіць іх. Усе князі іхнія — бунтаўнікі.
16 Павалены Эфраім, корань іхні ссох, ён ня дасьць плоду. А нават калі народзяць, Я заб'ю
ўлюбёных улоньня іхняга.
17 Адкіне іх Бог мой, бо яны ня слухалі Яго, і будуць яны ўцекачамі паміж народамі.

Ос 10

1 Ізраіль [быў] вінаградам буйным, для сябе прыносіў плод. Чым больш было пладоў, тым
больш ён памнажаў ахвярнікі, чым лепшай была зямля ягоная, тым прыгажэйшыя ставіў
слупы.
2 Падзеленае сэрца іхняе, цяпер яны вінаватыя. Ён пакрышыць ахвярнікі іхнія і зьнішчыць
слупы іхнія.
3 Бо цяпер яны скажуць: «Няма ў нас валадара, бо мы не баяліся ГОСПАДА. І валадар што для
нас зробіць?»
4 Прамаўляюць словы, прысягаюць хлусьліва, [калі] заключаюць запавет. І квітнее як палын
суд іхні на разорах палёў.
5 Жыхары Самарыі непакояцца пра цялятаў Бэт-Авэну, бо плача над ім народ ягоны і паганскія
службіты ягоныя галосяць над славай ягонай, бо яна адыходзіць ад яго.
6 Таксама яго завядуць у Асірыю як дар для валадара Ярэву. Эфраім пакрыецца ганьбаю, і
Ізраіль будзе асаромлены за рашэньне сваё.

7 Самарыя будзе зьнішчана, валадар ейны будзе як трэска на абліччы водаў.
8 І будуць зьнішчаныя вышыні Авэну, грэх Ізраіля. Церні і асот вырастуць на ахвярніках іхніх,
і будуць казаць да гораў: «Накрыйце нас!», і да пагоркаў: «Упадзіце на нас!»
9 Ад дзён Гівы грашыў ты, Ізраілю! Там вы засталіся. Не дасягнула іх у Гіве вайна супраць
сыноў беззаконьня.
10 Паводле ўпадабаньня Майго пакараю іх, зьбяруцца народы супраць іх, калі яны будуць
зьвязаныя за падвойную нягоднасьць сваю.
11 Эфраім — навучаная ялаўка, якая любіць малаціць, і Я ўскладу ярмо на тлусты карак ягоны.
Запрагу Эфраіма, будзе араць Юда, будзе баранаваць для яго Якуб.
12 Сейце для сябе ў праведнасьці, жніце ў міласэрнасьці, заорвайце для сябе дзірван, бо час
шукаць ГОСПАДА, аж пакуль Ён прыйдзе і вылье дажджом праведнасьць на вас.
13 Але вы аралі ліхоту, зьбіралі беззаконьне, елі плод хлусьні, бо ты спадзяваўся на шлях свой
і на мноства волатаў тваіх.
14 І паўстане гармідар сярод народу твайго, і ўсе замкі твае будуць зруйнаваныя, як Сальман
зруйнаваў Бэт-Арбэль у дзень бітвы; маці з сынамі будуць пасечаныя на кавалкі.
15 Гэтак зраблю вам, Бэтэль, з прычыны ліхоты ліхасьці вашай. Раніцаю зьнішчэньнем
зьнішчаны будзе валадар Ізраіля.

Ос 11

1 Калі Ізраіль быў дзіцём, Я палюбіў яго, і з Эгіпту паклікаў сына Майго.
2 Клікалі да іх [прарокі], а яны зыходзілі ад аблічча іхняга. Для Баала складалі ахвяры і для
ідалаў палілі кадзіла.
3 А Я вучыў хадзіць Эфраіма, браў іх на рамёны Мае, але яны не разумелі, што Я лячыў іх.
4 Вяроўкамі людзкімі Я цягнуў іх, путамі любові. І Я быў для іх, як той, хто здымае ярмо ад
сківіцаў іхніх, і схіляўся да іх, каб накарміць.
5 Ня вернецца ён у зямлю Эгіпецкую, але Асур будзе валадаром ягоным, бо яны не захацелі
навярнуцца [да Мяне].
6 І будзе меч шалець у гарадах ягоных, і паломіць засаўкі іхнія, і пажарэ іх за намеры іхнія.
7 А народ Мой упарта адварочваецца ад Мяне, і хоць яго клічуць да ўзгорняга, ён не
ўзвышаецца ў адзінстве.
8 Ці пакіну цябе, Эфраіме? Ці аддам цябе, Ізраілю? Ці пакіну цябе як Адму? Ці зраблю табе як
Цэвоіму? Пераварочваецца ў-ва Мне сэрца Маё, адначасна распалілася літасьць Мая.
9 Не зраблю паводле ярасьці гневу Майго і не вярнуся, каб зьнішчыць Эфраіма. Бо Я — Бог, а
не чалавек. Я — Сьвяты пасярод цябе. І Я не ўвайду ў горад.
10 Яны пойдуць за ГОСПАДАМ. Ён як леў зарыкае. Калі Ён зарыкае, прыйдуць з дрыжаньнем
сыны мора.
11 Прыйдуць з дрыжаньнем, як птушкі, з Эгіпту, і як галубы, з зямлі Асірыі, і Я пасялю іх у
дамах іхніх, кажа ГОСПАД.
12 Эфраім атачыў Мяне хлусьнёю, а дом Ізраіля — падступнасьцю, хоць Юда яшчэ трымаецца
з Богам і ў сьвятых рэчах верны.

Ос 12

1 Эфраім пасьвіць вецер і гоніцца за ветрам усходнім. Увесь дзень ён памнажае хлусьню і
спусташэньне, і заключае запавет з Асірыяй, і выносіць алей у Эгіпет.
2 ГОСПАД мае справу судовую з Юдам і пакарае Якуба паводле шляхоў ягоных, паводле
ўчынкаў ягоных верне [адплату] яму.
3 Яшчэ ва ўлоньні ён ухапіў за пяту брата свайго і сілаю сваёю змагаўся з Богам.
4 І змагаўся ён з анёлам, і перамог. Плакаў і прасіў ласкі ў Яго, у Бэтэлі знайшоў Яго, і там Ён
размаўляў з намі.
5 Гэта ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, ГОСПАД — памятнае [імя] Ягонае.
6 А ты вярніся да Бога твайго, захоўвай міласэрнасьць і суд, і заўсёды чакай на Бога твайго.

7 Ханаан у руцэ сваёй мае вагі фальшывыя, любіць прыгнёт.
8 І сказаў Эфраім: «Але я ўзбагаціўся, знайшоў сілу для сябе. У-ва ўсіх высілках маіх ня знойдзена ў-ва мне няправасьці, якая б была грахом».
9 Але Я — ГОСПАД, Бог твой, [ад выхаду] з зямлі Эгіпецкай. І Я зноў вярну цябе ў намёты, як у дні спатканьня [са Мною].
10 І Я прамаўляў да прарокаў, і Я памнажаў відзежы, і праз прарокаў даваў прыповесьці.
11 Калі ў Гілеадзе няправасьць, станецца [ўсё] марнотаю; [дарэмна] ў Гільгале валоў складаюць у ахвяру. Ахвярнікі іхнія — як крушня на разараным полі.
12 І ўцёк Якуб на палі Араму, і служыў Ізраіль за жонку, і за жонку пільнаваў [статак].
13 І праз прарока ГОСПАД вывеў Ізраіля з Эгіпту, і праз прарока Ён захоўваў яго.
14 Але Эфраім упарта раздражняў [Бога], і Ён пакінуў на ім кроў ягоную, і ганьбу ягоную верне яму Госпад ягоны.

Ос 13

1 Калі прамаўляў Эфраім, [усе] трымцелі, ён быў узвышаны ў Ізраілі. Але ён стаўся вінаватым праз Баала і памёр.
2 А цяпер павялічваюць грэх і робяць сабе літыя выявы са срэбра свайго, ідалаў паводле разуменьня свайго. Гэта ўсё ў іх выраб разьбярскі. Яны кажуць: «Людзі, якія складаюць ахвяры, няхай цалуюць цяля».
3 Дзеля гэтага будуць яны як туман ранішні, як раса, што хутка зьнікае, як мякіна, якую вецер разносіць на току, і як дым з коміну.
4 Але Я — ГОСПАД, Бог твой, [ад выхаду] з зямлі Эгіпецкай, і ты ня ведаў Бога, акрамя Мяне, і няма Збаўцы, акрамя Мяне.
5 І Я пазнаў цябе ў пустыні, у зямлі вельмі сухой.
6 На пашах сваіх яны насыціліся; яны насыціліся, і ўзганарылася сэрца іхняе, і яны забыліся пра Мяне.
7 І Я буду для іх як леў, як леапард на дарозе буду цікаваць [на іх].
8 Я сустрэну іх як мядзьведзіца, пазбаўленая дзяцей, і разарву заслону сэрца іхняга, і зьем іх там як леў; зьвер палявы разьдзярэ іх.
9 Ты сам сябе зьнішчыў, Ізраіль, бо ў-ва Мне дапамога твая.
10 Дзе цяпер валадар твой, які выбавіць цябе ў-ва ўсіх гарадах тваіх? І дзе судзьдзі твае, якім ты казаў: «Дай мне валадара і князёў»?
11 Я даў табе валадара ў гневе Маім і забраў яго ў абурэньні Маім.
12 Зьвязанае ў вузел беззаконьне Эфраіма, захаваны грэх ягоны.
13 Болі, як у парадзіхі, прыйдуць на яго. Ён — сын бяз мудрасьці, бо ня стаў у час у месцы нараджэньня сыноў.
14 Я выбаўлю іх ад рукі пекла, адкуплю іх ад сьмерці. Сьмерць, дзе джала тваё? Пекла, дзе перамога твая? Спачуваньне схаванае перад вачыма Маімі.
15 Хоць ён прыносіць плады між братамі, прыйдзе вецер усходні. Вецер ГОСПАДА з пустыні ўзьнімаецца, і прыбярэ жаролы ягоныя, і высушыць крыніцы ягоныя. Ён спустошыць скарбніцу ўсіх начыньняў каштоўных.

Ос 14

1 Вінаватая Самарыя, бо збунтавалася супраць Бога свайго. Яны ўпадуць ад мяча, немаўляты іхнія будуць пабітыя [аб скалу], і цяжарныя іхнія будуць пасечаныя.
2 Навярніся, Ізраілю, да ГОСПАДА, Бога твайго, бо ты спатыкнуўся ў беззаконьні тваім.
3 Вазьміце з сабою словы і навярніцеся да ГОСПАДА. Скажыце Яму: «Даруй усе беззаконьні і прыймі тое, што добрае, і мы прынясем ахвяру вуснаў нашых.
4 Асірыя ня збавіць нас. Ня будзем езьдзіць на конях і ня будзем казаць “божа наш” вырабу рук нашых. Бо ў Табе знойдзе міласьць сірата».
5 Я вылекую адступніцтва іхняе, палюблю іх ахвотна, бо гнеў Мой адвернецца ад іх

6 Я буду для Ізраіля як раса, ён заквітнее як лілея і пусьціць карані свае [як кедр] на Лібане.
7 Разрастуцца галіны ягоныя і станецца як у аліўкі хараство ягонае, і водар ягоны — як Лібан.
8 Вернуцца яны і будуць сядзець у ценю ягоным, ажывуць, як збожжа, расквітнеюць, як лаза
вінаградная, памяць іхняя — як віно Лібану.
9 Эфраім скажа: «Што мне ўжо да ідалаў?» Я адкажу табе і буду глядзець на цябе. Я — як
кіпарыс зялёны, дзякуючы Мне ты знаходзіш плод твой.
10 Хто мудры, няхай зразумее гэта, і хто разумны, няхай пазнае, бо простыя шляхі ГОСПАДА,
і праведныя будуць хадзіць па іх, а адступнікі спатыкнуцца.

КНІГА ПРАРОКА ЁЭЛЯ

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Ёэля, сына Пэтуэля.
2 Слухайце гэта, старыя, і прыхіліце вуха, усе жыхары зямлі. Ці было такое ў дні вашыя або ў
дні бацькоў вашых?
3 Распавядзіце пра гэта сынам вашым, а сыны вашыя — сынам сваім, а сыны іхнія —
пакаленьню наступнаму.
4 Тое, што засталося ад вусеняў, зьела саранча, што засталося ад саранчы, зьелі хрушчы, што
засталося ад хрушчоў, паелі чэрві.
5 Прачніцеся, п'яніцы, і плачце, і бядуйце ўсе тыя, што п'юць віно, па маладым віне, бо яно
забранае ад вуснаў вашых.
6 Бо прыйшоў на зямлю Маю народ дужы, якога безьліч. Зубы ягоныя — зубы ільвіныя, а
сківіцы — як у ільвіцы.
7 Ён зрабіў пустэчаю вінаграднік Мой, дрэва фігавае Маё паламаў, дашчэнту агаліў яго і
адкінуў; зьбялелі галіны ягоныя.
8 Галасі як маладзіца, падперазаная зрэбніцаю, над мужам маладосьці сваёй.
9 Забраныя ахвяры хлебныя і ахвяры вадкія ад Дому ГОСПАДА; у жалобе сьвятары, служыцелі
ГОСПАДА.
10 Поле спустошана, у жалобе зямля, бо стаптанае збожжа, высахла маладое віно, зьвяла
аліўка.
11 Смуткуйце, земляробы, галасіце, вінаградары, дзеля пшаніцы і дзеля ячменю, бо загінула
жніво ў полі.
12 Вінаградная лаза засохла, і дрэва фігавае зьвяла, дрэва гранатовае і пальма, і яблына, і ўсе
дрэвы палявыя пасохлі; бо высахла вясёласьць паміж сыноў чалавечых.
13 Падпержыцеся [зрэбніцай] і лямантуйце, сьвятары, галасіце, служыцелі ахвярніка,
хадзіце, начуйце ў зрэбніцы, служыцелі Бога майго, бо затрыманыя ахвяры хлебныя і ахвяры
вадкія ў Доме Бога вашага.
14 Прызначце сьвяты пост, склічце ўрачысты сход, зьбярыце старых і ўсіх жыхароў зямлі гэтай
у Дом ГОСПАДА, Бога вашага, і клічце да ГОСПАДА.
15 Гора дню гэтаму, бо блізка дзень ГОСПАДА, ён прыйдзе як спусташэньне ад Усемагутнага.
16 Хіба не перад вачыма нашымі забіраецца ежа, з Дому Бога нашага [забіраецца] радасьць і
пацяшэньне?
17 Згніла зерне пад скібамі сваімі, спусьцелі каморы, разбураныя пуні, бо высахла збожжа.
18 Як стогне скаціна, блукаюць чароды кароваў, бо няма для іх пашы, і чароды авечак
спустошаны.
19 Да Цябе, ГОСПАДЗЕ, гукаю, бо агонь зжэр пашы пустыні, і полымя спаліла ўсе дрэвы
палявыя.
20 Таксама жывёла палявая прагне да Цябе, бо ручаі водаў высахлі, і агонь зжэр пашы пустыні.

Ёэль 2

1 Трубіце ў рог на Сыёне, усклікайце на гары Маёй сьвятой! Дрыжыце, усе жыхары зямлі, бо
ідзе дзень ГОСПАДА, бо ён блізка,
2 дзень цемры і змроку, дзень хмары і імглы. Як зараніца рухаецца па гарах, [так] народ
шматлікі і дужы. Падобнага да яго не было спрадвеку і пасьля яго ня будзе аж да гадоў
пакаленьня і пакаленьня.
3 Перад абліччам ягоным агонь жарэ, а за ім полымя спальвае; як сад Эдэм зямля перад ім, а
за ім — спустошаная пустыня, і ніхто не ўцячэ ад яго.
4 Выгляд іхні — нібы выгляд коней, і, як вершнікі, так яны бягуць.
5 Як грукат калясьніцаў на вяршынях гор, яны імчаць, як трэскат полымя агню, які жарэ
салому, як народ дужы шыхтуецца да бітвы.
6 Ад аблічча ягонага дрыжаць народы, усе твары зьбялелі.

7 Як волаты яны бягуць, як ваяры ўзыходзяць на муры, і кожны ідзе па шляху сваім, і ня збочвае
са сьцежкі сваёй.
8 Адзін аднаго ня пхае, кожны ідзе дарогаю сваёй, яны падаюць на дзіды і ня гінуць.
9 У горад урываюцца, на муры ўзыходзяць, у дамы ўваходзяць, праз вокны ўлазяць як злодзей.
10 Перад абліччам Ягоным трасецца зямля, дрыжыць неба, сонца і месяц цямнеюць, і зоркі
губляюць бляск свой.
11 І ГОСПАД дае голас Свой перад абліччам войска Свайго, бо вельмі вялікі табар Ягоны, бо
магутны той, хто выконвае слова Ягонае, бо вялікі дзень ГОСПАДА і вельмі страшны, і хто
можа вытрымаць яго?
12 І нават цяпер, кажа ГОСПАД, навярніцеся да Мяне ўсім сэрцам сваім у посьце, з плачам і
галашэньнем.
13 І разьдзірайце сэрца вашае, а не адзеньні вашыя, і навярніцеся да ГОСПАДА, Бога вашага, бо
Ён ласкавы і спагадлівы, павольны да гневу і вельмі міласэрны, і шкадуе ў нядолі.
14 Хто ведае, ці Ён не павернецца [да вас], і не пашкадуе, і не пакіне дабраславенства ахвяры
хлебнай і ахвяры вадкай для ГОСПАДА, Бога вашага?
15 Трубіце ў рог на Сыёне, прызначце пост, склічце ўрачысты сход,
16 зьбярыце народ, прызначце [збор] царквы, склічце старых, зьбярыце дзяцей і немаўлят;
няхай выйдзе жаніх з пакою свайго і нявеста з-пад намёту свайго.
17 Паміж прысенкамі і ахвярнікам няхай плачуць сьвятары, служыцелі Божыя, і няхай кажуць:
«Пашкадуй, ГОСПАДЗЕ, народ Твой, і ня дай спадчыны Тваёй на ганьбаваньне, каб народы ня
мелі ўлады над ёю. Навошта маюць казаць між народамі: “Дзе Бог іхні?”»
18 І запалае ГОСПАД рэўнасьцю пра зямлю Сваю, і зьлітуецца над народам Сваім.
19 І адказаў ГОСПАД, і сказаў народу Свайму: «Вось, Я пашлю вам збожжа і маладое віно, і алей,
і вы насыціцеся імі, і не аддам вас больш на ганьбаваньне між народамі.
20 І [ворага] з поўначы аддалю ад вас, і выганю яго ў зямлю сухую і спустошаную, пярэднюю
[дружыну] ягоную — у мора ўсходняе, а заднюю [дружыну] — у мора заходняе; і ўзьнімецца
ад яго смурод, і пойдзе ад яго пах гнілізны, бо ён учыніў [ліха] вялікае.
21 Ня бойся, зямля, весяліся і радуйся, бо ГОСПАД зробіць вялікае.
22 Ня бойцеся, жывёлы палявыя, бо зазелянеюць пашы ў пустыні, бо дрэвы дадуць плады свае,
дрэва фігавае і вінаград дадуць сілу сваю.
23 А вы, сыны Сыёну, весяліцеся і радуйцеся ў ГОСПАДЗЕ, Богу вашым, бо Ён дасьць вам дождж
раньні паводле праведнасьці [Сваёй], і выльле на вас дождж, дождж раньні і дождж позьні, як
[было] раней.
24 І напоўняцца такі збожжам, і перапоўняцца тоўчні маладым віном і алеем.
25 І Я аднагароджу вам за тыя гады, у якія [ўсё] паелі саранча, хрушчы, чэрві і вусені — войска
Маё вялікае, якое Я паслаў супраць вас.
26 І будзеце есьці, ядучы, і насыціцеся, і будзеце хваліць імя ГОСПАДА, Бога вашага, Які робіць
для вас цудоўныя рэчы, і [больш] ня будзе асаромлены народ Мой на вякі.
27 І даведаецеся, што Я ёсьць сярод Ізраіля, і Я — ГОСПАД, Бог ваш, і няма іншага, і [больш] ня
будзе асаромлены народ Мой на вякі.
28 І станецца пасьля гэтага, Я выльлю Духа Майго на кожнае цела, і будуць прарочыць сыны
вашыя і дочкі вашыя, старыя вашыя будуць сьніць сны, юнакі вашыя будуць бачыць відзежы.
29 І таксама на слугаў і на служак выльлю ў тыя дні Духа Майго,
30 і дам цуды ў небе і на зямлі, кроў і агонь, і слупы дыму.
31 Сонца пераменіцца ў цемру, а месяц — у кроў, перад тым, калі прыйдзе дзень ГОСПАДА,
вялікі і страшны.
32 І станецца, кожны, хто будзе клікаць імя ГОСПАДА, будзе выбаўлены, бо на гары Сыён і
ў Ерусаліме будзе выбаўленьне, як сказаў ГОСПАД, і сярод тых, якія засталіся, якіх ГОСПАД
пакліча.

Ёэль 3

1 Бо вось, у тыя дні і ў тым часе, калі Я вярну палонных Юды і Ерусаліму,
2 Я зьбяру ўсе народы і прывяду іх у Даліну Язафата, і буду з імі судзіцца там за народ Мой і за
спадчыну Маю, Ізраіля, які яны расьцярушылі паміж народамі, і зямлю Маю падзялілі,
3 і пра народ Мой кідалі жэрабя, і аддавалі хлопчыка за распусьніцу, і продалі дзяўчынку за
віно, і пілі.
4 І што вы для Мяне, Тыр і Сідон, і ўсе акругі Філістынскія? Ці помстай аднагародзіце Мне?
Калі аднагародзіце Мне, лёгка і хутка Я вярну аднагароду вашую на галаву вашую.
5 Срэбра Маё і золата Маё вы ўзялі, і добрыя каштоўнасьці Мае перанесьлі ў сьвятыні вашыя,
6 а сыноў Юды і сыноў Ерусаліму продалі сынам Явану, каб аддаліць іх ад межаў іхніх.
7 Вось, Я ўзьніму іх з таго месца, куды вы прадалі іх, і вярну аднагароду вашую на галаву вашую,
8 і прадам сыноў вашых і дачок вашых праз рукі сыноў Юды, і яны прададуць іх Савеям, народу
далёкаму, бо ГОСПАД прамовіў [так].
9 Клічце пра гэта сярод народаў; пасьвяціцеся на вайну; пабудзіце волатаў; няхай наблізяцца,
няхай прыйдуць усе ваяры.
10 Перакуйце плугі вашыя на мячы і сярпы вашыя — на дзіды. Слабы няхай скажа: «Я — волат».
11 Зьбірайцеся і прыходзьце, усе народы навокал, і зьбярыцеся там. Вядзі, ГОСПАДЗЕ, волатаў
Тваіх.
12 Няхай прачнуцца народы і прыйдуць у Даліну Язафата; бо там Я сяду судзіць усе народы
навокал.
13 Пашліце серп, бо жніво сасьпела; прыйдзіце, тапчыце, бо тоўчня поўная, кадкі
пераліваюцца, бо вялікая ліхота іхняя.
14 Грамады, грамады ў Даліне Прысуду, бо блізкі дзень ГОСПАДА ў Даліне Прысуду.
15 Сонца і месяц зацемрацца, і зоркі страцяць бляск свой.
16 І ГОСПАД загрыміць з Сыёну, і выдасьць голас Свой з Ерусаліму, і задрыжаць неба і зямля;
але ГОСПАД — прыстанішча для народу Свайго і апора для сыноў Ізраіля.
17 І даведаецеся, што Я — ГОСПАД, Бог ваш, Які жыве на Сыёне, на гары Маёй сьвятой. І станецца
Ерусалім сьвятым, і чужынцы ўжо ня будуць хадзіць па ім.
18 І станецца ў той дзень: горы будуць ацякаць маладым віном, і з узгоркаў пацячэ малако, і ўсе
ручаіны Юды напоўняцца вадою, і крыніца выйдзе з Дому ГОСПАДА, і напоіць даліну Шыттым.
19 Эгіпет станецца спустошаным, і Эдом станецца спустошанай пустыняй за гвалт над сынамі
Юды, бо яны разьлівалі кроў нявінную ў зямлі іхняй.
20 Юда на вякі будзе заселены, і Ерусалім — з пакаленьня ў пакаленьне.
21 І Я пакараю за кроў іхнюю, [за якую яшчэ] не караў; і ГОСПАД будзе жыць на Сыёне.

КНІГА ПРАРОКА АМОСА

1 Словы Амоса, што быў [адным] з гадоўцаў авечак у Тэкоа, якія ён бачыў пра Ізраіль у дні Узіі,
валадара Юды, і ў дні Ерабаама, валадара Ізраіля, два [гады] перад землятрусам.
2 І ён сказаў: «ГОСПАД зарыкае з Сыёну і дасьць голас Свой з Ерусаліму, і сялібы пастухоў
будуць у жалобе, і высахне вяршыня Кармэлю.
3 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Дамаску, нават за чатыры, не дарую яму, бо яны малацілі
Гілеад зубцамі жалезнымі.
4 І Я спашлю агонь на дом Хазаэля, і ён зжарэ палацы Бэн-Гадада.
5 І Я разаб’ю засаўкі Дамаску, і вынішчу жыхароў з даліны Авэн і таго, хто трымае скіпетр у
Бэт-Эдэне, і народ Сірыі пойдзе ў палон да Кіра, кажа ГОСПАД”.
6 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Газы, нават за чатыры, не дарую ёй, бо яны ўсіх чыста
бралі ў палон паланеньнем, каб выдаць іх Эдому.
7 І Я спашлю агонь на муры Газы, і ён зжарэ палацы ейныя.
8 І Я вынішчу жыхароў Ашдоду і таго, хто трымае скіпетр у Ашкелоне, і павярну руку Маю на
Экрон, і загіне рэшта Філістынцаў, кажа Госпад ГОСПАД”.
9 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Тыру, нават за чатыры, не дарую яму, бо яны перадалі іх
усіх чыста паланеньнем Эдому і ня памяталі запавету братэрскага.
10 І Я спашлю агонь на муры Тыру, і ён зжарэ палацы ягоныя”.
11 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Эдому, нават за чатыры, не дарую яму, бо ён
перасьледаваў мячом брата свайго, утаймаваў спагадлівасьць сваю, і няспынна разьдзіраў
[яго] ў гневе сваім, і лютасьць ягоная трывала заўсёды.
12 І Я спашлю агонь на Тэман, і ён зжарэ палацы Боцры”.
13 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны сыноў Амона, нават за чатыры, не дарую яму, бо яны
распорвалі цяжарных у Гілеадзе, каб пашырыць межы свае.
14 І Я распалю агонь на мурах Раббы, і ён зжарэ палацы ейныя сярод крыку ў дзень бітвы, сярод
віхуры ў дзень буры.
15 І валадар іхні пойдзе ў палон, ён і князі ягоныя разам [з ім], кажа ГОСПАД”.

Ам 2

1 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны сыноў Мааву, нават за чатыры, не дарую яму, бо ён спаліў
на вапну косткі валадара Эдому.
2 І Я спашлю агонь на Мааў, і ён зжарэ палацы Керыёта, і памрэ Мааў сярод галасу, крыку і
голасу трубы.
3 І Я вынішчу судзьдзю спасярод яго, і заб’ю ўсіх князёў ягоных з ім, кажа ГОСПАД”.
4 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Юды, нават за чатыры, не дарую яму, бо яны пагрэбавалі
Законам ГОСПАДА і не захоўвалі прыказаньні Ягоныя, і зьвяла іх хлусьня іхняя, за якой пайшлі
бацькі іхнія.
5 І Я спашлю агонь на Юду, і ён зжарэ палацы Ерусаліму”.
6 Гэта кажа ГОСПАД: “За тры правіны Ізраіля, нават за чатыры, не дарую яму, бо яны продалі
за срэбра праведніка, і ўбогага — за [пару] сандалаў.
7 Яны топчуць у пыле зямным галаву бедных, і шлях уцісканых выкрыўляюць; і мужчына, і
бацька ягоны ходзяць да [адной] дзяўчыны, і гэтым зьневажаюць імя Маё сьвятое.
8 На адзеньні, узятым у заклад, кладуцца яны каля ўсіх ахвярнікаў, і віно засуджаных п’юць у
доме Бога свайго.
9 А Я зьнішчыў Амарэйца перад абліччам іхнім, вышыня якога была, як вышыня кедраў, і яны
былі моцныя, як дубы. А Я зьнішчыў плод ягоны ўгары і карані ягоныя ўнізе.
10 І Я вывеў вас з зямлі Эгіпецкай, і вадзіў вас сорак гадоў па пустыні, каб вы ўзялі ў спадчыну
зямлю Амарэйца.

11 І Я паставіў з сыноў вашых прарокаў і з юнакоў вашых — назіраў. Хіба ня так было, сыны
Ізраіля? — кажа ГОСПАД.
12 А вы паілі назіраў віном і загадвалі прарокам, кажучы: “Не прарочце!”
13 Вось, Я націсну на вас, як цісне воз, поўны снапоў.
14 І загіне, не ўцячэ спрытны, і дужы ня будзе моцны моцай сваёй, і волат ня выратуе душу
сваю.
15 Той, які страляе з луку, ня будзе стаяць, і спрытны ў нагах сваіх не ўратуецца, і коньнік ня
выратуе душу сваю.
16 І адважны сэрцам сваім сярод волатаў уцячэ голы ў той дзень, кажа ГОСПАД.

Ам 3

1 Слухайце слова гэтае, якое ГОСПАД прамовіў да вас, сыны Ізраіля, да ўсёй сям’і, якую Я вывеў
з зямлі Эгіпецкай, кажучы:
2 “Толькі вас Я пазнаў з усіх плямёнаў зямлі. Таму пакараю вас за ўсе беззаконьні вашыя.
3 Ці пойдуць два [чалавекі] разам, калі яны не дамовіліся?
4 Ці рыкае леў у лесе, калі ён ня мае здабычы? Ці львяня дае голас свой у логве сваім, калі не
злавіла [нічога]?
5 Ці можа птушка патрапіць у сіло на зямлі, калі пастка на яе не была [пастаўлена]? Ці сіло
рухаецца па зямлі, калі не патрапіла здабыча [ў яго]?
6 Калі трубіць у горадзе рог, хіба не дрыжаць людзі? Хіба бывае якое ліха ў горадзе, і ГОСПАД
не ўчыніў [яго]?
7 Бо Госпад ГОСПАД нічога ня робіць, калі не аб’явіць таямніцы Сваёй слугам Сваім, прарокам.
8 Леў рыкае, хто ня будзе баяцца? Госпад ГОСПАД прамовіў, хто ня будзе прарочыць?
9 Дайце пачуць [гэта] ў палацах у Ашдодзе і ў палацах у зямлі Эгіпецкай і кажыце: “Зьбярыцеся
на гарах Самарыі, і пабачце замяшаньне вялікае сярод яе, і прыгнёт унутры яе”.
10 І ня ведаюць яны, як рабіць справядліва, кажа ГОСПАД. Яны зьбіраюць гвалт і ліхадзейства
ў палацах сваіх.
11 Дзеля гэтага кажа Госпад ГОСПАД: “Прыгнятальнік [стане] вакол зямлі гэтай, і ён забярэ ў
цябе сілу тваю, і будуць абрабаваныя палацы твае”.
12 Гэта кажа ГОСПАД: “Як пастух ратуе з пашчы ільва дзьве галёнкі або кавалак вуха, так будуць
выратаваныя сыны Ізраіля, якія жывуць у Самарыі ў куце ложка і ў Дамаску на посьцілцы”.
13 Паслухайце і папярэдзьце дом Якуба, кажа Госпад ГОСПАД, Бог Магуцьцяў.
14 Бо ў той дзень, калі Я наведаю Ізраіль за правіны ягоныя, Я таксама наведаю ахвярнікі
Бэтэлю, і будуць адсечаныя рогі ахвярніку, і ўпадуць на зямлю.
15 Я зруйную дом зімовы і дом летні, і загінуць дамы з косьці слановай, і счэзне шмат дамоў,
кажа ГОСПАД.

Ам 4

1 Паслухайце слова гэтае, каровы Башану, якія на гары Самарыі, якія прыгнятаеце бедных,
штурхаеце ўбогіх, кажучы гаспадарам сваім: “Прынясі, і будзем піць”.
2 Прысягнуў Госпад ГОСПАД сьвятасьцю Сваёю, што, вось, прыйдуць на вас дні, і Ён падыме вас
на круках, і пазасталых вашых — на гачыках для рыбы.
3 І выйдзе, і [пойдзе] кожная перад сабою праз выломы [ў мурах], і кінуць вас у Гермоне, кажа
ГОСПАД.
4 “Прыйдзіце ў Бэтэль і рабіце беззаконьне; у Гільгале яшчэ больш рабіце беззаконьне і
прыносьце кожную раніцу ахвяры свае, кожныя тры дні — дзесяціны свае,
5 і паліце ахвяры падзякі з кіслым, і голасна абвяшчайце пра ахвяры дабраахвотныя, бо гэта
вы любіце, сыны Ізраіля, кажа Госпад ГОСПАД”.
6 І Я даў вам чысьціню зубоў у-ва ўсіх гарадах вашых і нястачу хлеба ў-ва ўсіх месцах вашых;
але вы не навярнуліся да Мяне, кажа ГОСПАД.
7 І Я таксама спыніў у вас дождж за тры месяцы да жніва, і выліў дождж на адзін горад, а на
другі ня выліў; адно поле было паліта дажджом, а поле, якое дождж не паліў, высахла.

8 І цягнуліся два і тры гарады ў адзін горад, каб піць ваду, і не маглі напіцца; але вы не
навярнуліся да Мяне, кажа ГОСПАД.
9 Я біў вас іржою і цьвільлю; мноства садоў вашых, і вінаграднікаў вашых, і дрэваў фігавых
вашых, і дрэваў аліўкавых вашых пажэрлі вусені, але вы не навярнуліся да Мяне, кажа ГОСПАД.
10 Я спаслаў на вас пошасьць, як заразу ў Эгіпце, забіваў мячом юнакоў вашых, і забраў у палон
коней вашых, і ўзьняў да ноздраў вашых смурод табараў вашых, але вы не навярнуліся да
Мяне, кажа ГОСПАД.
11 Я зьнішчыў вас, як Бог зьнішчыў Садом і Гамору, і вы былі, як галавешка, уратаваная з агню;
але вы не навярнуліся да Мяне, кажа ГОСПАД.
12 Дзеля гэтага Я гэтак зраблю табе, Ізраіль. А калі Я зраблю гэтак табе, прыгатуйся да сустрэчы
з Богам тваім, Ізраіль!
13 Бо Ён — Той, Які фармуе горы і стварае вецер, і выяўляе чалавеку думкі Свае, робіць зараніцу
цемраю і крочыць па ўзгорках зямлі; ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, — імя Ягонае.

Ам 5

1 Паслухайце слова гэтае, якое я ўзьнімаю над вамі, галашэньне пра дом Ізраіля:
2 “Упала, больш ня ўстане дзяўчына Ізраіля. Яна кінутая на зямлю сваю, няма каму падняць
яе”.
3 Бо гэтак кажа Госпад ГОСПАД: “У горадзе, з якога выходзіла тысяча, застанецца сто, а з якога
выходзіла сто, застанецца дзесяць [чалавек] з дому Ізраіля”.
4 Бо гэтак кажа ГОСПАД дому Ізраіля: “Шукайце Мяне, і будзеце жыць.
5 І не шукайце ў Бэтэлі, і не зыходзьце ў Гільгал, і не пераходзьце ў Бээр-Шэву, бо Гільгал будзе
палонены палонам, а Бэтэль станецца марнотаю”.
6 Шукайце ГОСПАДА, і будзеце жыць, каб Ён не ўвайшоў як агонь у дом Язэпа і ня зжэр [усё], і
ня будзе каму тушыць [яго] ў Бэтэлі.
7 Вы ператвараеце суд у палын, і праведнасьць на зямлю кідаеце.
8 А Ён — Той, Які ўчыніў Стажар’е і Касцоў, і цень сьмерці ператварае ў раніцу, і дзень робіць
цёмным як ноч. Ён кліча воды мора і вылівае іх на аблічча зямлі; ГОСПАД — імя Ягонае.
9 Ён прысьпешвае загубу супраць дужага, і прыходзіць загуба на замак.
10 Яны ненавідзяць таго, хто дакарае ў браме [гораду], і брыдзяцца тым, хто гаворыць
беззаганна.
11 Дзеля гэтага за тое, што вы топчаце бедных і забіраеце ў іх стравы са збожжа, [хоць]
вы пабудавалі дамы з чэсанага камяня, але ня будзеце жыць у іх, вы пасадзілі прывабныя
вінаграднікі, але ня будзеце піць віна з іх.
12 Бо Я ведаю шматлікія правіны вашыя і цяжкія грахі вашыя; вы прыгнятаеце праведніка,
берацё хабары і [справу] ўбогіх у браме выкрыўляеце.
13 Дзеля гэтага разумны ў гэты час маўчыць, бо гэта час ліхі.
14 Шукайце дабра, а ня ліха, каб вы маглі жыць; і гэтак ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, будзе з вамі,
як вы кажаце.
15 Ненавідзьце ліха і любіце дабро, і пастаўце ў браме суд. Можа, ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, будзе
ласкавы да рэшты Язэпа.
16 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, Госпад: “На ўсіх плошчах лямант, і на ўсіх
вуліцах будуць казаць: “Аёй! Аёй!”, і будуць клікаць земляроба на жалобу і тых, якія ведаюць
галашэньні, каб галасілі!
17 І ў-ва ўсіх вінаградніках будзе лямант, бо Я прайду сярод цябе, кажа ГОСПАД”.
18 Гора вам, якія жадаюць дня ГОСПАДА! Навошта вам гэты дзень ГОСПАДА? Ён — цемра, а не
сьвятло.
19 [Гэта так], як чалавек уцячэ ад ільва, і сустрэне мядзьведзя; або прыйшоў у дом, і абапёрся
рукою сваёю аб сьцяну, і яго ўкусіла зьмяя.
20 Хіба ня ёсьць дзень ГОСПАДА цемрай, а не сьвятлом? Ён — цемрадзь, і няма бляску [сьвятла]
ў ім.
21 Я ненавіджу, Я грэбую сьвятамі і не адчуваю паху прыемнага на ўрачыстых сходах вашых.

22 Бо калі вы складаеце мне цэласпаленьні і ахвяры хлебныя вашыя, Мне не даспадобы яны. І на ахвяры мірныя вашыя з кормнай жывёлы Я не пагляджу.
23 Прыбяры ад Мяне голас сьпеваў тваіх, і гуку гусьляў тваіх Я ня буду слухаць.
24 Але няхай суд цячэ як вада, і праведнасьць — як магутны ручай.
25 Ці прыносілі вы Мне ахвяры [крывавыя] і ахвяры хлебныя ў пустыні сорак гадоў, доме Ізраіля?
26 Але вы насілі намёт Малоха вашага і Кіюна, абразы вашыя, зорку багоў вашых, якую вы сабе рабілі.
27 За гэта Я завяду вас у палон далёка за Дамаск, кажа ГОСПАД. Бог Магуцьцяў — імя Ягонае.

Ам 6

1 Гора бесклапотным на Сыёне і тым, якія спадзяюцца на гару Самарыі, якія прызначаныя пачаткам народаў, да якіх прыйшоў дом Ізраіля!
2 Зыйдзіце ў Кальнэ і пабачце, а адтуль ідзіце да Хамат-Раббы і зыйдзіце ў Гат Філістынскі. Ці вы лепшыя за валадарствы гэтыя? Ці мяжа іхняя большая за мяжу вашую?
3 Вы лічыце далёкім дзень ліхі і набліжаецеся да пасаду гвалту.
4 Вы ляжыце на ложку з косьці слановай, і качаецеся на засланых посьцілках, і ясьцё авечак з чарады і цялятаў з аборы.
5 Вы брынкаеце на гусьлях, як Давід, прыдумляеце сабе інструмэнты музычныя.
6 Вы п'іцё віно куфлямі і мажацеся найлепшымі масьцямі, але не смуткуеце з прычыны загубы Язэпа!
7 Дзеля гэтага яны пойдуць у палон на чале палонных, і будзе аддалена банкетаваньне ад тых, якія качаліся [ў раскошы]".
8 Прысягнуў Госпада ГОСПАД на душу Сваю, кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў. Мне агідная пыхлівасьць Якуба, і Я ненавіджу палацы ягоныя; і Я выдам [ворагу] горад і тое, што напаўняе яго.
9 І станецца, што калі ў адным доме застанецца дзесяць мужчынаў, і яны памруць.
10 І возьме яго дзядзька ягоны, і спаліць яго, каб вынесьці косткі з дому, і скажа таму, хто ў сярэдзіне дому: "Ці ёсьць яшчэ [хто] ў цябе?" А той скажа: "Няма". І ён скажа: "Маўчы, бо нельга ўзгадваць імя ГОСПАДА";
11 Бо вось, ГОСПАД загадае і разаб'е дом вялікі ў руіны, а дом малы — у друз.
12 Ці бягуць коні па скале? Ці аруць [мора] на валах? Бо вы ператварылі суд у атруту і плады праведнасьці — у палын.
13 Вы радуецеся ў Лё-Дабар, і кажаце: "Ці ж ня сілаю сваёю мы здабылі сабе рогі?"
14 Але, вось, Я ўзьніму на вас, дом Ізраіля, кажа ГОСПАД, Бог Магуцьцяў, народ, і яны будуць уціскаць вас ад уваходу ў Хамат аж да ручая Арабы"».

Ам 7

1 Гэта паказаў мне Госпад ГОСПАД. І вось, Ён уфармаваў саранчу, калі пачала расьці атава, і вось, атава была пасьля касьбы для валадара.
2 І сталася, калі [саранча] скончыла есьці траву на зямлі, я сказаў: «Госпадзе, ГОСПАДЗЕ! Калі ласка, даруй! Як устане Якуб? Бо ён малы».
3 Пашкадаваў ГОСПАД пра гэта. «Ня будзе [гэтага]», — сказаў ГОСПАД.
4 Гэта паказаў мне Госпад ГОСПАД. І вось, Госпад ГОСПАД паклікаў агонь, каб праводзіць спрэчку, і ён зжэр бяздоньне вялікае, і зжэр частку [зямлі].
5 І я сказаў: «Госпадзе ГОСПАДЗЕ, калі ласка, спыні! Як устане Якуб? Бо ён малы».
6 Пашкадаваў ГОСПАД пра гэта. «Ня будзе гэтага», — сказаў Госпад ГОСПАД.
7 Гэта Ён паказаў мне. І вось, Госпад стаіць на муры стромкім і ў руцэ Ягонай — грунтвага.
8 І сказаў ГОСПАД мне: «Што ты бачыш, Амосе?» І я сказаў: «Грунтвагу». І сказаў Госпад: «Вось, Я павешу грунтвагу сярод народу Майго, Ізраіля, і ўжо больш не прайду каля іх.

9 І будуць спустошаныя ўзгоркі Ісаака, і сьвятыні Ізраіля будуць зруйнаваныя, і Я паўстану з
мячом на дом Ерабаама».
10 І паслаў Амацыя, сьвятар з Бэтэлю, да Ерабаама, валадара Ізраіля, кажучы: «Амос змовіўся
супраць цябе пасярод дому Ізраіля. Ня можа зямля вытрываць усіх словаў ягоных.
11 Бо гэтак сказаў Амос: “Ад мяча памрэ Ерабаам, і Ізраіль паланеньнем будзе выведзены ў
палон з зямлі сваёй”».
12 І сказаў Амацыя Амосу: «Відушчы, ідзі, уцякай сабе ў зямлю Юды, і еш там хлеб, і там
прароч,
13 але ў Бэтэлі больш не спрабуй прарочыць, бо ён — сьвятыня валадара і дом валадарства».
14 І адказаў Амос, і сказаў Амацыі: «Я — не прарок, і я — ня сын прарока, бо я — звычайны
пастух і зьбіраю сыкаморы.
15 І ўзяў мяне ГОСПАД, калі я [ішоў] за авечкамі, і сказаў мне ГОСПАД: “Ідзі, прароч народу
Майму, Ізраілю”.
16 І цяпер слухай слова ГОСПАДА. Ты кажаш: “Не прароч на Ізраіля і не прапаведуй на дом
Ісаака”.
17 Дзеля гэтага кажа ГОСПАД: “Жонка твая будзе распусьнічаць у горадзе, а сыны твае і дочкі
твае ўпадуць ад мяча, і зямля твая будзе падзелена шнурам [меральным], і ты памрэш у зямлі
нячыстай, і Ізраіль паланеньнем пойдзе ў палон з зямлі сваёй”».

Ам 8

1 Гэта Госпад ГОСПАД паказаў мне. І вось, кош з летняй [садавінай].
2 І сказаў Ён: «Што ты бачыш, Амосе?» І я сказаў: «Кош з летняй [садавінай]». І сказаў ГОСПАД
мне: «Канец прыйшоў народу Майму Ізраілю, і ўжо больш не прайду каля іх.
3 І будуць галасіць [замест] сьпеваў сьвятыні ў той дзень, кажа Госпад ГОСПАД; шмат будзе
трупаў на кожным месцы, і кінуць іх моўчкі».
4 Паслухайце гэта вы, якія топчаце ўбогага і вынішчаеце ўцісканых зямлі,
5 кажучы: «Калі міне маладзік, будзем продаць збожжа; і ў суботу адчынім [сьвірны]
са збожжам і зьменшым эфу, і павялічым [цану] сыкля, і будзем абважваць на шалях
падманлівых,
6 каб купляць бедных за срэбра і ўбогага — за [пару] сандалаў, і продаць высеўкі збожжа».
7 Прысягнуў ГОСПАД на гонар Якуба: «Ніколі не забудуся ўсіх учынкаў іхніх!
8 Ці не захістаецца ад гэтага зямля? Ці не залямантуе кожны, хто жыве на ёй? І яна ўздымаецца
як рака, і ўсхвалюецца, і затопіць, як рака Эгіпецкая».
9 І станецца ў той дзень, кажа Госпад ГОСПАД, што Я зраблю заход сонца апоўдні, і зацямню
зямлю сярод яснага дня,
10 і перамяню сьвяты вашыя ў жалобу і ўсе сьпевы вашыя — у галашэньне, і ўскладу на ўсе
сьцёгны зрэбніцу, і на кожную галаву — лысіну, і зраблю гэта, як жалобу па адзіным [сыне], і
канец гэтага — як дзень горычы.
11 Вось, прыходзяць дні, кажа Госпад ГОСПАД, і Я пашлю голад на зямлю, ня голад хлеба, і ня
смагу вады, але [голад], каб слухаць словы ГОСПАДА.
12 І будуць бадзяцца ад мора да мора, і з поўначы на ўсход будуць кружляць, шукаючы слова
ГОСПАДА, і ня знойдуць.
13 У той дзень будуць млець прыгожыя дзяўчаты і хлопцы.
14 Тыя, якія прысягаюць на правіну Самарыі і кажуць: “Няхай жыве бог твой, Дане!” і “Няхай
жыве шлях у Бээр-Шэву!”, упадуць і больш ня ўстануць.

Ам 9

1 Я бачыў Госпада, Які стаяў на ахвярніку, і Ён сказаў: «Удар па бэльцы, і затрасуцца вушакі, і
ўпадуць на галовы ўсіх іх. А тых, якія застануцца, Я заб’ю мячом. Не ўцячэ той, які ўцякае, і
не схаваецца той, які хаваецца.
2 Нават калі яны закапаюцца ў апраметную, адтуль рука Мая возьме іх. Нават калі яны
ўзьлезуць у неба, адтуль Я скіну іх.

3 Нават калі яны схаваюцца на вяршыні Кармэлю, і там адшукаю іх і вазьму іх. Нават калі
схаваюцца перад вачыма Маімі на дне мора, і там загадаю зьмею, і ён укусіць іх.
4 І нават калі яны пойдуць у палон перад абліччам ворагаў сваіх, там загадаю мячу, і ён заб'е
іх; і Я зьвярну вочы Мае на іх на ліха, а не на дабро.
5 І Госпад, ГОСПАД Магуцьцяў, дакранецца да зямлі, і яна растопіцца, і залямантуюць усе, якія
жывуць на ёй, і яна ўся ўздымецца, як рака, і затопіць, як рака Эгіпецкая.
6 Той, Які збудаваў сьвяцілы Свае ў небе і скляпеньні Свае заклаў на зямлі, кліча воды марскія
і вылівае іх на аблічча зямлі. ГОСПАД — імя Ягонае.
7 Хіба вы для Мяне не такія, сыны Ізраіля, як сыны Кушанаў, кажа ГОСПАД? Хіба ня Я вывеў
Ізраіля з зямлі Эгіпецкай, а Філістынцаў — з Кафтору, і Сірыйцаў — з Кіру?
8 Вось, вочы Госпада ГОСПАДА — супраць валадарства грэху, і Я зьнішчу яго з аблічча зямлі,
але зьнішчаючы, ня зьнішчу дом Якуба, кажа ГОСПАД.
9 Бо, вось, Я загадаю і расьцярушу дом Ізраіля паміж усіх народаў так, як сеюць у рэшаце, і не
ўпадуць зярняты на зямлю.
10 Ад мяча памруць усе грэшнікі народу Майго, якія кажуць: "Не наблізіцца, не сустрэне нас
ліха".
11 У той дзень Я пастаўлю намёт Давіда, які ўпаў, зараблю выломы ягоныя, і аднаўлю руіны
ягоныя, і адбудую яго, як у дні старадаўнія,
12 каб яны ўспадкаемілі рэшту Эдому і ўсе народы, над якімі клікалі імя Маё, кажа ГОСПАД,
Які робіць гэта.
13 Вось, прыходзяць дні, кажа ГОСПАД, што араты сустрэне жняца, а той, які топча вінаград,
таго, які сее насеньне; і з гор будзе сьцякаць маладое віно, і ўсе ўзгоркі растопяцца.
14 І Я вярну палонных народу Майго Ізраіля, і яны адбудуюць гарады спустошаныя, і будуць
жыць, і пасадзяць вінаграднікі, і будуць піць віно іхняе, і закладуць сады, і будуць есьці плады
іхнія.
15 І Я пасаджу іх на зямлі іхняй, і ня будуць больш выганяць іх з зямлі іхняй, якую Я даў ім,
кажа ГОСПАД, Бог твой».

КНІГА ПРАРОКА АБАДЫІ

1 Відзеж Абадыі. Гэтак сказаў Госпад ГОСПАД да Эдому. Вестку мы пачулі ад ГОСПАДА, і пасол
між народаў пасланы: «Устаньце, і станьма на вайну супраць яго!»
2 Вось, малым Я зраблю цябе сярод народаў, ты [будзеш] вельмі пагарджаны.
3 Пыхлівасьць сэрца твайго зьвяла цябе, які жывеш у расколінах скалы, які на вышыні [маеш]
сялібу і кажаш у сэрцы тваім: «Хто скіне мяне на зямлю?»
4 Калі ўздымешся, як арол, і калі між зоркамі зробіш гняздо сваё, адтуль Я скіну цябе, кажа
ГОСПАД.
5 Калі б злодзеі прыйшлі да цябе, калі б рабаўнікі ўночы так панішчылі цябе, ці ня ўкралі б
яны, колькі ім трэба? Калі б зьбіральнікі вінаграду прыйшлі да цябе, ці не пакінулі б яны
недазьбіранае?
6 Як абшуканы Эзаў! Як перагледжаны сховы ягоныя!
7 Аж да мяжы прагналі цябе; усе мужы запавету твайго ашукалі цябе, перамаглі цябе мужы
супакою твайго; тыя, што [елі] хлеб твой, паставілі пастку на цябе, [думаючы, што] няма
разважлівасьці ў цябе.
8 Ці ня [станецца] ў той дзень, кажа ГОСПАД, што Я вынішчу мудрых з Эдому і разважлівасьць
— з гары Эзава?
9 І спалохаюцца волаты твае, Тэмане, каб быў зьнішчаны забіваньнем кожны [чалавек] з гары
Эзава.
10 За ліхадзейства супраць брата твайго Якуба пакрые цябе сорам, і ты будзеш зьнічшаны на
вякі.
11 У той дзень, калі ты стаяў супраць [яго], у дзень, калі чужынцы бралі ў палон багацьце
ягонае і чужыя ўвайшлі ў брамы ягоныя і адносна Ерусаліму кідалі жэрабя, ты таксама [быў]
як адзін з іх.
12 І ты глядзі на дзень брата твайго, на дзень няшчасьця ягонага; і ты ня цешся з сыноў Юды ў
дзень бедства іхняга і не раскрывай вусны свае ў дзень загубы.
13 Не ўваходзь у брамы народу Майго ў дзень няшчасьця іхняга, таксама не глядзі на гора
ягонае ў дзень няшчасьця ягонага, і не выцягвай [руку тваю] на багацьце ягонае ў дзень
няшчасьця ягонага.
14 І ня стой на скрыжаваньнях, каб забіваць уцекачоў ягоных, і не выдавай пазасталых ягоных
у дзень нядолі.
15 Бо блізкі дзень ГОСПАДА на ўсе народы. Як ты зрабіў, будзе зроблена табе. Аднагарода твая
вернецца на галаву тваю.
16 Бо як вы пілі на гары Маёй сьвятой, так будуць піць заўсёды ўсе народы. І будуць піць, і
будуць хлябтаць; і стануцца яны, нібы іх не было.
17 А на гары Сыён будзе выбаўленьне, і будзе яна сьвятая; і дом Якуба возьме ў спадчыну
валоданьні іхнія.
18 І станецца дом Якуба агнём, а дом Язэпа — полымем, а дом Эзава — саломай, і яны будуць
палаць супраць іх, і ня будзе пазасталых у доме Эзава, бо ГОСПАД прамовіў [гэта].
19 І ўспадкаемяць [жыхары] Нэгеву гару Эзава, а [жыхары] Шэфэлі — Філістынцаў; і
ўспадкаемяць поле Эфраіма і поле Самарыі, а Бэн'ямін [успадкаеміць] Гілеад.
20 І палонныя войска гэтага, сыны Ізраіля, [успадкаемяць] Хананейцаў аж да Царфату, і
палонныя з Ерусаліму, якія ў Сэфарадзе, успадкаемяць гарады Нэгеву.
21 І ўзыйдуць вызваліцелі на гару Сыён, каб судзіць гару Эзава, і станецца валадарства
ГОСПАДА.

КНІГА ПРАРОКА ЁНЫ

1 І было слова ГОСПАДА да Ёны, сына Амітая, кажучы:
2 «Устань, ідзі ў Ніневу, горад вялікі, і кажы супраць яго, бо ўзышло ліхоцьце іхняе перад аблічча Маё».
3 І ўстаў Ёна, каб уцячы ў Таршыш ад аблічча ГОСПАДА, і зыйшоў у Яфу, і знайшоў карабель, які плыў у Таршыш; і даў плату, і зыйшоў на карабель, каб плыць з імі ў Таршыш ад аблічча ГОСПАДА.
4 Але ГОСПАД пусьціў вялікі вецер на мора, і ўзьнялася вялікая бура на моры, і думалі, што карабель разаб'ецца.
5 І напалохаліся маракі, і крычалі кожны да бога свайго, і выкінулі ў мора рэчы, што былі на караблі, каб быў лягчэйшым; а Ёна зыйшоў у сярэдзіну карабля, і лёг, і моцна заснуў.
6 І наблізіўся да яго корнік, і сказаў яму: «Што табе, што ты сьпіш? Устань, кліч да Бога свайго, можа, узгадае Бог пра нас, і мы не загінем».
7 І сказалі адзін аднаму: «Хадземце, кіньма жэрабя, і даведаемся, праз каго гэтае ліха [прыйшло] на нас». І кінулі жэрабя, і выпала жэрабя на Ёну.
8 І сказалі яму: «Скажы нам, з якой прычыны гэтае ліха [прыйшло] на нас? Які занятак твой? Адкуль ты прыйшоў? З якога ты краю і з якога народу?»
9 І ён сказаў ім: «Я — Гебрай, і я баюся ГОСПАДА, Бога нябёсаў, Які ўчыніў мора і сухазем'е».
10 І спалохаліся тыя людзі страхам вялікім, і сказалі яму: «Чаму ты гэта зрабіў?», бо даведаліся тыя людзі, што ён уцякае ад аблічча ГОСПАДА, бо ён абвясьціў ім [гэта].
11 І сказалі яму: «Што нам зрабіць з табою, каб сьціхла мора?», бо мора ўсё больш бушавала.
12 І ён сказаў ім: «Вазьміце мяне і кіньце ў мора, і супакоіцца мора, [якое] супраць вас, бо я ведаю, што з-за мяне гэтая бура вялікая супраць вас».
13 І моцна веславалі тыя людзі, каб вярнуцца на сухую зямлю, і не маглі, бо мора больш і больш бушавала супраць іх.
14 І клікалі яны да ГОСПАДА, і сказалі: «ГОСПАДЗЕ, молім Цябе, няхай не загінем мы за душу чалавека гэтага, і не ўскладай на нас кроў нявінную, бо Ты, ГОСПАДЗЕ, як захочаш, так і зробіш».
15 І яны паднялі Ёну, і кінулі яго ў мора, і перастала мора гневацца.
16 І напалохаліся тыя людзі страхам вялікім перад ГОСПАДАМ, і складалі яны ахвяры ГОСПАДУ, і абяцалі абяцаньні.

Ёна 2

1 І вызначыў ГОСПАД вялікую рыбу, каб праглынула Ёну, і быў Ёна ў нутры рыбы тры дні і тры ночы.
2 І маліўся Ёна да ГОСПАДА, Бога свайго, з нутра рыбы,
3 і сказаў: «Я клікаў да ГОСПАДА з нядолі маёй, і Ён адказаў мне; з нутра адхлані я загаласіў, і Ты пачуў голас мой.
4 Ты кінуў мяне глыбока ў сэрца мораў, і вір акружыў мяне, усе плыні Твае і хвалі Твае прайшлі праз мяне.
5 І я сказаў: "Я прагнаны ад вачэй Тваіх. Як я пагляджу яшчэ на сьвятую сьвятыню Тваю?"
6 Нахлынулі воды на мяне аж да душы, глыбіня агарнула мяне навокал, травы марскія абвілі галаву маю.
7 Да падвалінаў гор я зыйшоў, зямля заваламі сваімі замкнула мяне на вякі. Але Ты вывеў са зьнішчэньня жыцьцё маё, ГОСПАДЗЕ, Божа мой.
8 Калі млела душа мая ў-ва мне, я ўзгадаў ГОСПАДА, і малітва мая прыйшла да Цябе, да сьвятой сьвятыні Тваёй.
9 Тыя, што захоўваюць марнасьці манлівыя, адкідаюць міласэрнасьць ад сябе.
10 Але я з голасам падзякі прынясу ахвяру Табе, споўню, што абяцаў. Збаўленьне ў ГОСПАДА».

11 І сказаў ГОСПАД рыбе, і яна выкінула Ёну на сухазем'е.

Ёна 3

1 І было слова ГОСПАДА да Ёны другі раз, кажучы:
2 «Устань, ідзі ў Ніневу, горад вялікі, і абвяшчай супраць яго тое, што Я сказаў табе».
3 І ўстаў Ёна, і пайшоў у Ніневу паводле слова ГОСПАДА; а Ніневa была вялікім горадам у Бога,
на тры дні дарогі ў абход.
4 І пачаў ён хадзіць па горадзе, колькі можна прайсьці за адзін дзень, і клікаў, і казаў: «Яшчэ
сорак дзён, і Ніневa будзе зруйнаваная».
5 І паверылі Ніневіцы Богу, і абвясьцілі пост, і апрануліся ў зрэбніцу ад найбольшага з іх аж да
найменшага з іх.
6 Бо калі слова дайшло да валадара Ніневы, ён устаў з пасаду свайго, і скінуў з сябе адзеньне
сваё, і апрануўся ў зрэбніцу, і сядзеў у попеле.
7 І было абвешчана, і сказана ў Ніневе паводле загаду валадара і магнатаў ягоных, кажучы:
«Няхай ані чалавек, ані быдла, ані валы, ані авечкі нічога не паспытаюць, няхай ані пасьвяцца,
ані п'юць вады,
8 але няхай апрануцца ў зрэбніцу чалавек і быдла, і няхай клічуць голасна да Бога, і няхай
кожны чалавек адвернецца ад злога шляху свайго і ад ліхадзейства, якое ў руках ягоных.
9 Хто ведае, ці ня зьвернецца Бог [да нас], і ці не пашкадуе, і ці не адверне гнеў палючы Свой,
каб мы не загінулі?»
10 І ўбачыў Бог учынкі іхнія, што яны адвярнуліся ад злога шляху свайго, і пашкадаваў Бог пра
ліха, пра якое сказаў, што ўчыніць ім, і не ўчыніў.

Ёна 4

1 І моцна засмуціўся Ёна праз гэта, і загневаўся.
2 І маліўся ён да ГОСПАДА, і казаў: «Прашу Цябе, ГОСПАДЗЕ, ці ня гэткае было слова маё, калі
яшчэ я быў у зямлі сваёй? Дзеля гэтага я загадзя ўцёк у Таршыш, бо я ведаў, што Ты — Бог
літасьцівы і спагадлівы, павольны да гневу і міласэрны, і шкадуеш [рабіць] зло.
3 І цяпер, ГОСПАДЗЕ, прашу Цябе, вазьмі душу маю ад мяне, бо лепш мне памерці, чым жыць».
4 І сказаў ГОСПАД: «Ці добра ты робіш, што гневаешся?»
5 І выйшаў Ёна з гораду, і сеў з усходняга боку гораду, і зрабіў сабе там будан, і сеў пад ім у
ценю, каб убачыць, што станецца ў горадзе.
6 І вызначыў ГОСПАД Бог расьліну, і яна вырасла над Ёнаю, каб быць ценем яму над галавою,
каб ён пазбавіўся засмучэньня свайго; і ўзрадаваўся Ёна радасьцю вялікай праз тую расьліну.
7 І вызначыў Бог чарвяка, калі ўзыйшла зараніца раніцаю, і ён падтачыў расьліну, і яна ссохла.
8 І сталася, калі ўзыйшло сонца, што Бог вызначыў гарачы ўсходні вецер, і сонца пякло галаву
Ёне, ажно ён млеў, і зычыў душы сваёй памерці, і сказаў: «Лепш мне памерці, чым жыць».
9 І сказаў Бог Ёне: «Ці добра, што так злуешся з-за расьліны?» І той сказаў: «Я раблю добра,
што гневаюся аж да сьмерці».
10 І сказаў ГОСПАД: «Ты шкадуеш расьліну, каля якой ты не працаваў і якую не расьціў, якая
вырасла за ноч і загінула за ноч.
11 А Я ці ня меў бы шкадаваць Ніневы, гэтага гораду вялікага, у якім больш як дванаццаць
дзясяткаў тысячаў людзей, што ня могуць адрозьніць правай рукі сваёй ад левай, і шмат
быдла?»

КНІГА ПРАРОКА МІХЕЯ

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Міхея з Марэшэты ў дні Ётама, Ахаза і Эзэкіі, валадароў Юды,
якое ён бачыў адносна Самарыі і Ерусаліму.
2 Пачуйце, усе народы, прыхілі вуха, зямля і ўсё, што напаўняе яе! І няхай будзе Госпад
ГОСПАД як сьведка супраць вас, Госпад са сьвятыні Сваёй сьвятой.
3 Бо, вось, ГОСПАД выходзіць з месца Свайго, і зыходзіць, і крычыць на вышынях зямлі.
4 І горы топяцца прад Ім, і даліны расьцякаюцца, як воск перад абліччам агню, як воды, якія
ільюцца па схілах.
5 За правіну Якуба [адбываецца] ўсё гэта і за грахі дому Ізраіля. Якая правіна Якуба? Ці ж не
Самарыя? І якія ўзгоркі ў Юды? Ці ж не Ерусалім?
6 І Я зраблю Самарыю як купу друзу ў полі, як [месца], каб садзіць вінаград, і скіну ў даліну
камяні ейныя, і падмуркі ейныя агалю.
7 І ўсе балваны ейныя будуць пабітыя, і ўсе платы [за распусту] ейную будуць спалены агнём, і
ўсе ідалы ейныя зраблю пустэчаю, бо яна сабрала іх за плату за распусту, і на плату за распусту
яны вернуцца.
8 З гэтае прычыны я лямантую і галашу, хаджу босы і голы; учыню лямант, як цмокі, і жалобу,
як страусы.
9 Бо раны ейныя невылечныя, бо прыйшло [гэта] да Юды, дакранаецца да брамы народу Майго,
да Ерусаліму.
10 Не абвяшчайце [гэта] ў Гаце і плачам ня плачце; у Бэт-Леафры качайцеся ў пыле.
11 Ідзі сабе, жыхарка Шафіру, у голасьці і ганьбе; ня выйдзе жыхарка Цаанану; лямант Гаэцэлю
ня дасьць вам спыніцца ў ім.
12 Бо чакала дабра жыхарка Мароту, але ліха зыйшло ад ГОСПАДА да брамы Ерусаліму.
13 Запражы дрыгантаў у калясьніцу, жыхарка Ляхішу. Ты — пачатак грэху для дачкі Сыёну, бо
ў цябе знойдзены правіны Ізраіля.
14 Дзеля гэтага дасі ліст разводны для Марэшэт-Гату; дамы Ахзіва — падман для валадароў
Ізраіля.
15 Яшчэ спадкаемцу прывяду да цябе, жыхарка Марэшы. Аж да Адуляму пойдзе слава Ізраіля.
16 Пастрыжыся і пагаліся з прычыны сыноў асалоды тваёй; пашыр лысіну тваю, як у арла, бо
яны пойдуць у палон ад цябе.

Міх 2

1 Гора тым, якія прыдумляюць беззаконьне і абдумваюць ліхоцьце на ложках сваіх, а ў сьвятле
раніцы выконваюць гэта, бо гэта ў моцы рук іхніх.
2 Зажадаюць яны палёў, і забіраюць іх, і дамоў — і бяруць [іх]; яны прыгнятаюць гаспадара і
дом ягоны, чалавека і спадчыну ягоную.
3 Дзеля гэтага так кажа ГОСПАД: «Вось, Я задумляю на племя гэтае ліха, ад якога вы ня ўхіліце
шыяў вашых, і ня будзеце хадзіць ганарліва, бо гэта час ліхі».
4 У той дзень складуць прыповесьць пра вас, і будуць галасіць галашэньнем, і скажуць:
«Зьнішчэньнем мы зьнішчаны. Доля народу Майго зьмянілася. Навошта забраная яна ад
мяне! Забраўшы, Ты падзяліў палі нашыя».
5 Дзеля гэтага ня будзе ў цябе таго, хто мераў бы шнуром паводле жэрабя ў царкве ГОСПАДА.
6 «Не прапаведуйце», а яны прапаведуюць: «Не прапаведуйце нам, і аддаліцца ганьба».
7 Ты, які завешся домам Якуба, няўжо скараціўся Дух ГОСПАДА? Няўжо такія ўчынкі Ягоныя?
Ці ж ня словы Мае робяць дабро для таго, хто ходзіць у правасьці?
8 Але ўчора народ Мой паўстаў як вораг. Вы забіраеце вопратку ў тых, якія праходзяць [каля
вас] бясьпечна, якія не імкнуцца ваяваць.
9 Жанчынаў народу Майго вы выганяеце з утульных дамоў іхніх, у дзяцей іхніх забіраеце
велічнасьць Маю на вякі.

10 Устаньце і ідзіце, бо няма [тут] супачынку, гэта [месца] нячыстае, яно — загуба для [вас],
загуба страшэнная.
11 Калі б чалавек, які ходзіць за ветрам і хлусьнёю падманвае, [сказаў]: «Я буду прапаведаваць
пра віно і сікеру», ён стаў бы прапаведнікам для народу гэтага.
12 Я зьбіраньнем зьбяру ўсяго цябе, Якубе, зграмаджэньнем зграмаджу рэшту Ізраіля,
пастаўлю іх разам, як авечак у Боцры, як чараду пасярод пашы ейнай, і будзе гоман ад
[мноства] людзей.
13 Узыйдзе Той, Які зломіць [перашкоды] перад абліччам іхнім; яны праломяць і пойдуць праз
браму, і ўвойдуць праз яе, і валадар іхні — перад абліччам іх, і ГОСПАД на чале іх.

Міх 3

1 І я сказаў: «Паслухайце, прашу, галовы Якуба і начальнікі дому Ізраіля. Ці ж ня вам ведаць
суд?
2 Вы ненавідзіце дабро і любіце ліха, зьдзіраеце з іх скуру іхнюю, і цела іхняе — з костак іхніх.
3 Вы ясьцё цела народу майго і зьдзіраеце з іх скуру іхнюю, і ломіце косткі іхнія, і расьсякаеце
іх нібы ў гаршчок, і цела [іхняе] — нібы на патэльню?
4 Тады яны будуць клікаць да ГОСПАДА, але Ён не адкажа ім, і схавае аблічча Сваё ад іх у той
час, бо яны робяць ліхоту ўчынкамі сваімі.
5 Гэта кажа ГОСПАД пра прарокаў, якія зводзяць народ мой, якія калі [маюць што] кусаць
зубамі сваімі, крычаць: «Мір!», а калі [ніхто нічога] не кладзе ў вусны іхнія, яны пасьвячаюцца
на вайну супраць іх.
6 Дзеля гэтага [будзе] ноч для вас, і ня [будзе] відзежу, і [будзе] цёмна ў вас, і ня [будзе]
прадказаньня; зойдзе сонца над прарокамі, і сьцямнее дзень над імі.
7 І будуць асаромлены відушчыя, і будуць у ганьбе прадказальнікі, усе яны закрыюць вусны
свае, бо ня будзе адказу ад Бога.
8 А я напоўнены моцай ад Духа ГОСПАДА, і судом, і магутнасьцю, каб абвяшчаць Якубу правіны
ягоныя і Ізраілю — грэх ягоны.
9 Пачуйце гэта, прашу, галовы дому Якуба і начальнікі дому Ізраіля. Вы брыдзіцеся судом і
крывіце ўсё простае.
10 Вы будуеце Сыён на крыві і Ерусалім — на беззаконьні.
11 Галовы ягоныя судзяць за хабары, і сьвятары ягоныя навучаюць за плату, і прарокі ягоныя
прадказваюць за срэбра; і абапіраюцца на ГОСПАДА, кажучы: «Хіба няма ГОСПАДА сярод нас?
Ня прыйдзе на нас ліха».
12 Дзеля гэтага гара Сыён будзе ўзарана як поле, і Ерусалім станецца купай друзу, і гара Дому
[Божага] — лясным узгоркам.

Міх 4

1 І станецца ў апошнія дні, гара Дому ГОСПАДА будзе пастаўлена на вяршыні гор і будзе
ўзвышана па-над узгоркамі, і пацякуць да яе народы.
2 І пойдуць шмат народаў, і скажуць: «Пойдзем і ўзыйдзем на гару ГОСПАДА і ў Дом Бога
Якубавага, і Ён навучыць нас шляхам Сваім, і мы будзем хадзіць па сьцежках Ягоных». Бо з
Сыёну выйдзе закон, і слова ГОСПАДА — з Ерусаліму.
3 І Ён будзе судзіць паміж шматлікімі народамі, і будзе дакараць народы магутныя, якія
далёка; і яны перакуюць мячы свае на плугі і дзіды свае на сярпы; не падыме народ на народ
мяча і ня будуць больш вучыцца ваяваць.
4 І кожны будзе сядзець пад вінаграднай лазой сваёй і пад дрэвам фігавым сваім, і ніхто ня
будзе палохаць іх, бо вусны ГОСПАДА Магуцьцяў прамовілі [гэта].
5 Бо [хоць] усе народы будуць хадзіць кожны ў імя бога свайго, мы будзем хадзіць у імя
ГОСПАДА, Бога нашага, на вякі вечныя.
6 У той дзень, кажа ГОСПАД, Я зьбяру кульгавых і зграмаджу выгнаных і тых, на каго Я навёў
ліха.

7 І Я зраблю кульгавых рэштаю, і адкінутых — народам магутным, і ГОСПАД будзе валадарыць
над імі на гары Сыён ад цяпер і на вякі.
8 А ты, Мігдал-Эдэр, узгорак дачкі Сыёну, да цябе прыйдзе і ўвойдзе [да цябе] панаваньне
ранейшае, валадарства дачкі Ерусаліму.
9 Чаму ж ты цяпер усклікаеш голасна? Ці ж няма валадара ў цябе? Ці загінуў дарадца твой,
што ахапіў боль цябе, як тую, што нараджае?
10 Війся і крычы [ад болю], дачка Сыёну, як тая, што нараджае; бо цяпер ты выйдзеш з гораду
і будзеш жыць у полі, і пойдзеш у Бабілон; там будзеш выратаваная; там ГОСПАД вызваліць
цябе з рукі ворагаў тваіх.
11 А цяпер сабраліся супраць цябе шмат народаў, кажучы: «Няхай яна будзе апаганена, і няхай
нагледзяцца на Сыён вочы нашыя!»
12 Але яны ня ведаюць намеру ГОСПАДА і не разумеюць рады Ягонай, бо Ён сабраў іх, як снапы
на ток.
13 Устань і малаці, дачка Сыёну, бо Я зраблю рог твой з жалеза і капыты твае зраблю з медзі,
і ты скрышыш шмат народаў, і зробіш заклятым для ГОСПАДА прыбытак іхні і багацьце іхняе
[аддасі] для ГОСПАДА ўсёй зямлі.

Міх 5

1 Цяпер зьбяры войскі, дачка войскаў! Аблягуць нас аблогаю, дубцом будуць біць па шчоках
судзьдзю Ізраіля.
2 Ты, Бэтлеем-Эфрата, — найменшы сярод тысячаў Юды, з цябе выйдзе для Мяне Той, Які будзе
Правадыром у Ізраілі, Які паходзіць здаўна, ад дзён старадаўніх.
3 Дзеля гэтага Ён выдасьць іх аж да часу, калі народзіць тая, што мае нарадзіць; і пазасталыя з
братоў Ягоных вернуцца да сыноў Ізраіля.
4 І стане Ён, і будзе пасьвіць у моцы ГОСПАДА, у слаўнасьці імя ГОСПАДА, Бога Свайго, і яны
будуць жыць [там], бо ад гэтага [часу] Ён узьвялічыцца аж да канцоў зямлі.
5 І Ён будзе супакой. Калі Асур прыйдзе ў зямлю нашую і калі будзе таптаць палацы нашыя,
тады мы выставім супраць яго сем пастыраў і восем князёў чалавечых.
6 І яны будуць мячом пасьвіць зямлю Асура і зямлю Німрода каля ўваходаў іхніх. І Ён выратуе
ад Асура, калі той прыйдзе ў зямлю нашую і калі будзе таптаць межы нашыя.
7 І будзе рэшта Якуба сярод мноства народаў, як раса ад ГОСПАДА, як дождж на траву, якога
не спадзяешся ад чалавека і не чакаеш ад сыноў чалавечых.
8 І будзе рэшта Якуба сярод народаў, сярод мноства народаў, як леў сярод зьвяроў лесу,
як ільвяня сярод чарады авечак, якое, калі ўвойдзе, топча і разьдзірае, і [ніхто] ня можа
выратаваць.
9 Узьнімецца рука твая на прыгнятальнікаў тваіх, і ўсе ворагі твае будуць зьнішчаны.
10 І станецца ў той дзень, кажа ГОСПАД, Я зьнішчу коней тваіх сярод цябе і скрышу калясьніцы
твае;
11 і зьнішчу гарады ў зямлі тваёй, і зруйную ўсе замкі твае;
12 і зьнішчу чараваньне рукі тваёй, і варажбітоў ня будзе ў цябе;
13 і зьнішчу балванаў тваіх і слупы твае пасярод цябе, і ня будзеш ужо пакланяцца вырабу рук
тваіх;
14 і Я павырываю астартаў тваіх спасярод цябе; і панішчу гарады твае.
15 І ўчыню ў гневе і абурэньні помсту над народамі, якія не былі паслухмяныя [Мне].

Міх 6

1 Пачуйце, прашу, што кажа ГОСПАД. Устань, спрачайся з гарамі, і няхай слухаюць узгоркі
голас твой.
2 Слухайце справу судовую ГОСПАДА, горы і магутныя падваліны зямлі; бо справа судовая ў
ГОСПАДА з народам Ягоным, і з Ізраілем Ён судзіцца.
3 «Народзе Мой, што Я зрабіў табе і чым Я абцяжарыў цябе? Адкажы Мне.

4 Бо Я вывеў цябе з зямлі Эгіпецкай, і выкупіў цябе з дому няволі, і паслаў перад абліччам тваім
Майсея, Аарона і Мірыям.
5 Народзе Мой, узгадай, прашу, што надумаў Балак, валадар Мааву, і што адказаў яму Білеам,
сын Бэора, і [што было] ад Шытыму аж да Гільгалу, каб ты пазнаў праведнасьць ГОСПАДА».
6 З чым я выйду перад аблічча ГОСПАДА? Як схілюся перад Богам, [Які] на вышынях? Ці выйду
перад аблічча Ягонае з цэласпаленьнямі, з цялятамі аднагадовымі?
7 Ці ГОСПАДУ даспадобы тысяча бараноў, дзесяць тысячаў струмянёў алею? Ці аддам
першароднага майго за віну маю, плод улоньня майго — за грэх душы маёй?
8 Паведамлена табе, чалавеча, што добрае, і што ГОСПАД шукае ў цябе: каб ты чыніў суд
[справядлівы], і любіў міласэрнасьць, і хадзіў пакорліва з Богам тваім.
9 Голас ГОСПАДА кліча ад гораду, і [той, хто мае] цьвярозы розум, баіцца імя Твайго: «Пачуйце
кій і Таго, Хто прызначыў яго.
10 Ці ёсьць яшчэ ў доме бязбожніка скарбы бязбожнасьці і эфа няпоўная, праклятая?
11 Ці Я маю ачысьціць шалі бязбожныя і торбу з камянямі падманлівымі?
12 Багацеі ягоныя поўныя гвалту, і жыхары ягоныя хлусяць, і язык іхні здрадлівы ў вуснах
іхніх.
13 Таму Я ўдару цябе хваробаю, спустошу цябе за грахі твае.
14 Ты будзеш есьці, але не насыцішся; і пусты [страўнік] твой у нутры тваім; і будзеш хаваць,
але не выратуеш; а што выратуеш, тое Я аддам пад меч.
15 Ты будзеш сеяць, і ня будзеш жаць; ты будзеш таўчы аліўкі, і ня будзеш мазацца алеем; і
[будзеш таўчы] вінаград, і ня будзеш піць віна.
16 Бо вы захоўваеце пастановы Омры і ўсе справы дому Ахава, і ходзіце паводле рады іхняй.
Дзеля гэтага Я аддам цябе на спусташэньне і жыхароў тваіх — на насьмешку, і ты панясеш
ганьбу народу Майго».

Міх 7

1 Гора мне! Я стаўся як недазьбіраная [садавіна] летняя, як рэшта ад збору вінаграду, няма
гронкі на ежу, [няма] сьпелай фігі, якой жадае душа мая.
2 Загінуў багабойны на зямлі, і няма правага сярод людзей; усе цікуюць на кроў; кожны палюе
на брата свайго, [ставячы] пастку.
3 Да зла [скіраваныя] абедзьвума рукамі, каб рабіць яго спраўна, князь вымагае [хабару], і
судзьдзя [вымагае] платы, і вялікі выказвае згубнае [жаданьне] душы сваёй, і выкрыўляюць
усё.
4 Найлепшы з іх — як церне, правы — як жываплот. Дзень вартаўнікоў Тваіх і наведваньня
Твайго надыйшоў; цяпер будзе зьбянтэжанасьць у іх.
5 Ня верце бліжняму, не спадзявайцеся на сябра; ад той, якая ляжыць на ўлоньні тваім,
захоўвай дзьверы вуснаў тваіх.
6 Бо сын зьневажае бацьку, дачка паўстае супраць маці сваёй, нявестка — супраць сьвякрыві
сваёй, і ворагі чалавеку хатнія ягоныя.
7 А я буду глядзець на ГОСПАДА, буду спадзявацца на Бога збаўленьня майго. Бог мой пачуе
мяне.
8 Ня радуйся з мяне, вораг мой! Хоць я ўпаў, я ўстану; хоць я жыву ў цемры, ГОСПАД — сьвятло
для мяне.
9 Гнеў ГОСПАДА я буду насіць, бо я зграшыў супраць Яго, аж пакуль Ён не разгледзіць справу
маю і не правядзе суд мой. Ён вывядзе мяне на сьвятло, я ўбачу праведнасьць Ягоную.
10 І ўбачыць [гэта] вораг мой, і пакрые сорам таго, які сказаў мне: «Дзе ГОСПАД, Бог твой?»
Вочы мае будуць глядзець на яго, цяпер патопчуць яго, як балота на вуліцах.
11 У дзень, калі агароджа твая будзе пабудаваная, у той дзень далёка пашырыцца пастанова
[Божая].
12 У той дзень прыйдуць да цябе і з Асірыі, і аж да гарадоў умацаваных, і ад гарадоў умацаваных
аж да ракі, і ад мора да мора, і ад гары да гары.
13 Але будзе зямля на спусташэньне за жыхароў ейных, за плады ўчынкаў іхніх.

14 Пасьві народ Твой дубцом Тваім, авечак спадчыны Тваёй, якія жывуць асобна ў лесе, сярод
Кармэлю. Няхай яны пасьвяцца ў Башане і Гілеадзе, як у дні старадаўнія.
15 Як у дні выхаду ягонага з зямлі Эгіпецкай, Я пакажу яму цуды.
16 Убачаць народы і будуць асаромленыя з усёю моцаю сваёю; паложаць руку на вусны, вушы
іхнія стануцца глухія.
17 Яны будуць лізаць пыл, як зьмеі, як паўзуны зямныя. Яны будуць напалоханыя ў норах
сваіх; перад ГОСПАДАМ, Богам нашым, будуць дрыжаць, і будуць баяцца Цябе.
18 Які Бог падобны да Цябе, Які даруеш беззаконьне і абмінаеш віну рэшты спадчыны Тваёй,
Які трымаеш заўсёды гнеў Твой, бо маеш упадабаньне ў міласэрнасьці?
19 Ён павернецца, зьявіць нам міласьць, загладзіць беззаконьні нашыя. Ты кінеш у глыбіні
мора ўсе грахі нашыя.
20 Ты зьявіш праўду Якубу, міласэрнасьць Абрагаму, як прысягнуў бацькам нашым у дні
даўнейшыя.

КНІГА ПРАРОКА НАВУМА

1 Цяжар адносна Нінівы. Кніга відзежаў Навума Элькашаніна.
2 Бог зайздросны і помсьлівы ГОСПАД; помсьлівы ГОСПАД і Пан гняўлівы. ГОСПАД помсьціць супраціўнікам Сваім і палае гневам на ворагаў Сваіх.
3 ГОСПАД павольны да гневу і вялікі сілаю, і не пакідае без пакараньня вінаватага. ГОСПАД, у буры, у віхуры шлях Ягоны, і хмара — пыл ад ног Ягоных.
4 Ён утаймоўвае мора і высушвае яго, і ўсе рэкі высушвае; марнее Башан і Кармэль, і кветка Лібану вяне.
5 Горы дрыжаць перад Ім, і ўзгоркі растаюць, і зямля паднялася перад абліччам Ягоным, і сусьвет, і ўсе, што жывуць у ім.
6 Перад абліччам абурэньня Ягонага хто ўстаіць? І хто вытрывае жар гневу Ягонага? Ярасьць Ягоная выліваецца, як агонь, і скалы крышацца перад Ім.
7 Добры ГОСПАД, апора ў дзень трывогі, і Ён ведае тых, якія маюць надзею ў Ім,
8 але нястрымнай залевай Ён учыніць загубу месцу [ліхому], і за ворагамі Ягонымі будзе гнацца цемра.
9 Што вы задумалі супраць ГОСПАДА? Ён учыніць загубу, не паўстане ў другі раз бедства.
10 Бо яны спляліся як цярніна, напіліся напоямі [сваімі], і зжарэ іх [агонь] як салому цалкам высхлую.
11 З цябе выйшаў той, які задумаў ліха супраць ГОСПАДА, дарадца Бэліяла.
12 Гэтак кажа ГОСПАД: «Хоць яны бясьпечныя і шматлікія, але яны будуць пасечаныя і зьнікнуць. І Я ўціскаў цябе, але больш ня буду ўціскаць цябе.
13 І цяпер Я зламлю ярмо ягонае, якое на табе, і кайданы твае разарву».
14 І загадаў ГОСПАД супраць цябе, [Нініва]: «Больш ня будзе сеяцца [насеньне] імя твайго. З дому багоў тваіх Я вынішчу [ідалаў] рэзьбленых і [ідалаў] літых. Я зраблю магілу тваю, бо ты праклятая».
15 Вось, на горах ногі дабравесьніка, які абвяшчае супакой. Сьвяткуй, Юда, сьвяты твае, выконвай абяцаньні твае, бо больш ня будзе Бэліял праходзіць па табе; ён цалкам зьнішчаны!

Нав 2

1 Узыходзіць разбуральнік перад аблічча тваё, [Нініва]! Захоўвай умацаваньні, паглядай на дарогу, умацоўвай сьцёгны, зьбяры сілы свае,
2 бо вярнуў ГОСПАД веліч Якуба і веліч Ізраіля, бо спустошылі іх спусташыцелі і панішчылі вінаградныя галіны іхнія.
3 Шчыты волатаў ягоных чырвоныя, ваяры [апрануты] ў кармазын, калясьніцы блішчаць агнём у дзень падрыхтоўкі да бітвы, і як кіпарысы хістаюцца [дзіды].
4 Па вуліцах шалёна імчаць калясьніцы і грукочуць на плошчах; выгляд іхні — [полымя] паходні, ляцяць яны як бліскавіцы.
5 [Нініва] ўзгадае пра слаўных сваіх, але яны спатыкнуцца ў хадзе сваёй; яны сьпяшаюцца на муры ейныя, але ўжо стаіць аблога.
6 Брамы рэкаў адчыняцца, і палац растопіцца.
7 І пастаноўлена: яна будзе аголеная, выведзеная [ў палон], і нявольніцы ейныя будуць стагнаць, як галубы, б'ючы сябе ў грудзі.
8 І Нініва — як сажалка водаў ад [пачатку] дзён сваіх, і вось, яны ўцякаюць. "Стойце, стойце!", але ніхто не заварочвае.
9 Рабуйце срэбра, рабуйце золата, бо няма канца назапашанаму і славе ўсіх рэчаў каштоўных.
10 [Нініва] апусьцелая, спустошаная і спляжаная, і сэрца растала, і калені калоцяцца, і боль у-ва ўсіх сьцёгнах, і аблічча ўсіх счарнелі.
11 Дзе сяліба ільвоў, і дзе жыруюць ільвяняты? Дзе хадзіў леў і ільвіца? Там жыў леў і ніхто не трывожыў [яго].

12 Леў разьдзіраў здабычу для ільвянятаў сваіх і душыў для ільвіцаў сваіх, і напоўніў здабычай
пячоры свае і логавішчы свае — разьдзёртым.
13 Вось, Я супраць цябе, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і Я спалю сярод дыму калясьніцы твае, і меч
зжарэ ільвянятаў тваіх, і Я вынішчу з зямлі здабычу тваю, і ня будзе больш чуваць голас паслоў
тваіх.

Нав 3

1 Гора гораду крыві! Увесь ён хлусьлівы, поўны гвалту, рабаваньне не адыходзіць ад яго.
2 Гук пугі, і грукат колаў, і тупат коней, і калясьніцы ляскочуць,
3 вершнік нясецца, і полымя мяча, і зіхценьне дзіды; і мноства забітых, і безьліч целаў, і няма
канца трупам, і спатыкаючыся, спатыкаюцца аб трупы.
4 [Гэта] — за мноства распусты распусьніцы спраўнай, прывабнай, пані чараваньня, якая
продала народы праз распусту сваю і плямёны — за чараваньні свае.
5 Вось, Я супраць цябе, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і Я ўзьніму прыполы [шатаў] тваіх на аблічча
тваё, і пакажу народам голасьць тваю, і валадарствам — ганьбу тваю.
6 І кіну агіднасьць на цябе, і зьняважу цябе, і выстаўлю цябе як відовішча.
7 І станецца, што кожны, хто гляне на цябе, уцячэ ад цябе і скажа: «Зруйнавана Нініва! Хто
будзе плакаць па ёй?» Дзе я знайду пацяшыцеляў для цябе?
8 Ці ты лепшая за Но-Амон, які сядзіць сярод рэкаў, воды вакол яго, у яго вал — мора, і ад мора
муры ягоныя?
9 Куш — сіла ягоная, і Эгіпет, і ён ня мае межаў, Пут і Лібія былі дапамогай ягонай.
10 Але таксама ён выселены і пайшоў у палон; таксама дзеці ягоныя былі пасечаныя на рагах
усіх вуліцаў, і пра шляхту ягоную кідалі жэрабя, і ўсе магнаты ягоныя зьвязаныя ланцугамі.
11 І ты таксама будзеш п'яная, і будзеш хавацца, ты таксама будзеш шукаць абароны ад ворага.
12 Усе замкі твае — як дрэвы фігавыя са сьпелымі пладамі. Калі трасуць іх, яны валяцца ў вусны
таго, хто есьць [іх].
13 Вось, народ твой — як жанчыны ўнутры цябе. Для ворагаў тваіх шырока адчыненыя брамы
зямлі тваёй, і зжэр агонь завалы твае.
14 Вады [на час] аблогі начэрпай сабе; умацуй замкі твае; ідзі ў балота, таўчы гліну, рабі печы
цагельныя.
15 Там зжарэ цябе агонь, пасячэ цябе меч, паядуць цябе хрушчы; множся, як хрушчы, множся,
як саранча.
16 Ты памножыла купцоў сваіх больш, чым зорак на небе; але хрушчы раскінуць [крылы] і
палятуць.
17 Каранаваныя твае — як саранча, ваяводы твае — як мошка, якая мае табар у платах у халодны
дзень, а як сонца ўзыйдзе, яны адлятаюць, і [ніхто] ня ведае месца іхняе, дзе яны.
18 Сьпяць пастухі твае, валадару Асірыі, слаўныя твае ляжаць, расьцярушаны народ твой па
горах, і няма каму сабраць яго.
19 Няма лекаваньня хваробе тваёй, балючая рана твая. Усе, хто пачуе вестку пра цябе, будуць
пляскаць у далоні над табою, бо да каго ўвесь час не прыходзіла ліхота твая?

КНІГА ПРАРОКА АБАКУМА

1 Цяжар, які бачыў Абакум прарок.
2 Як доўга, ГОСПАДЗЕ, я буду галасіць і Ты ня будзеш чуць? Я крычу да Цябе: “Гвалт!”, а Ты не
збаўляеш.
3 Дзеля чаго Ты паказваеш мне няправасьць і глядзіш на нядолю? Злачынствы і гвалт перада
мною, і пачынаецца спрэчка, і ўзьнімаецца сварка.
4 Дзеля гэтага ня дзейнічае Закон, і ніколі ня мае моцы суд. Бязбожнікі абступілі праведніка,
і таму суд выходзіць скрыўленым.
5 «Паглядзіце на народы і прыгледзьцеся, і зьдзіўленьнем зьдзівіцеся, бо Я зраблю справу ў дні
вашыя, што не паверыце, калі вам раскажуць [пра яе].
6 Бо, вось, Я ўзьніму Халдэйцаў, народ горкі і хуткі, які праходзіць па прасторы зямлі, каб узяць
у спадчыну сялібы не свае.
7 Страшны і грозны ён; ад яго самога выходзіць суд ягоны і годнасьць ягоная.
8 Шпарчэйшыя за леапардаў коні ягоныя і небясьпечнейшыя за ваўкоў вечаровых; і
расьсеюцца [шырока] вершнікі ягоныя, і вершнікі ягоныя прыйдуць здалёк, палятуць, як арол,
які кідаецца на здабычу.
9 Усе яны прыходзяць [чыніць] гвалт; абліччы іхнія зьвернутыя, як вецер усходні, і яны
зьбіраюць палонных як пяску.
10 І з валадароў яны насьміхаюцца, і князі будуць посьмехам для іх; з усіх замкаў яны
сьмяюцца, бо насыпаюць вал, і здабываюць іх.
11 Тады зьменіцца дух [ягоны], і ён прыйдзе, і будзе абвінавачаны, бо сіла ягоная — [гэта] бог
ягоны».
12 Ці ня Ты спрадвеку, ГОСПАДЗЕ, Божа мой, Сьвяты мой? Мы не памром. ГОСПАДЗЕ, Ты
паставіў яго на суд. Скала [мая], Ты прызначыў яго дзеля пакараньня.
13 Чыстыя вочы [Твае], каб глядзець на зло, і Ты ня можаш глядзець на нядолю. Чаму Ты
глядзіш на адступнікаў, маўчыш, калі бязбожнік глытае таго, хто больш праведны за яго?
14 І Ты робіш, што людзі — як рыба ў моры, як паўзуны; няма пана над імі.
15 [Вораг] выцягвае ўсіх іх вудаю, загортвае іх у нерат свой і зьбірае іх у трыгубіцу сваю; з
гэтага цешыцца і весяліцца.
16 Дзеля гэтага ён складае ахвяру нерату свайму і кадзіць трыгубіцы сваёй, бо праз іх тлустая
частка ягоная і сытая ежа ягоная.
17 Ці ж дзеля гэтага ён закідвае нерат свой і заўсёды забівае народы бяз літасьці?

Абк 2

1 На варце маёй я стану, і ўзыйду на вежу, і буду выглядаць, каб убачыць, што Ён прамовіць да
мяне і што Ён адкажа на скаргу маю.
2 І адказаў мне ГОСПАД, і сказаў: «Запішы відзеж і патлумач на табліцах, каб чытач лёгка мог
[зразумець] гэта.
3 Бо відзеж [датычыць] вызначанага часу, і датычыць канца, і не падмане; хоць ён марудзіць,
чакай на яго, бо ён, прыходзячы, прыйдзе, ня спозьніцца.
4 Вось, у ганарыстага няшчырая душа ягоная ў ім, а праведны з веры сваёй жыць будзе.
5 І, як віно здрадлівае, чалавек пыхлівы, і ён ня мае супакою, ён разьзяўляе, як апраметную,
душу сваю, і ён, як сьмерць, не насыціцца, але зьбірае да сябе ўсе народы і зграмаджвае да сябе
ўсе плямёны».
6 Ці ж усе яны не складуць прыповесьць пра яго і кплівую загадку пра яго, і скажуць: “Гора
таму, хто памнажае [багацьце], якое не ягонае. Як доўга [гэта будзе]? [Гора] таму, хто
абцяжарвае сябе ўзятым у заклад!”
7 Хіба не паўстануць зьнянацку тыя, якія ўкусяць цябе, і хіба не прачнуцца тыя, якія будуць
трэсьці цябе, і ты станешся здабычай для іх?

8 За тое, што ты рабаваў шмат народаў, абрабуюць цябе ўсе пазасталыя плямёны за кроў
людзкую і за гвалт над зямлёю, над горадам і над усімі, хто жыве ў ім.
9 Гора таму, хто здабывае прыбытак бязбожны для дому свайго, каб зьвіць на вышыні гняздо
сваё, каб захаваць сябе ад рукі ліхога.
10 Ты ўчыніў ганьбу для дому свайго, бо выразаў шмат народаў, і саграшыў супраць душы
сваёй,
11 бо камень з муру закрычыць, і бэлька драўляная адкажа яму.
12 Гора таму, хто будуе горад на крыві і засноўвае горад умацаваны на беззаконьні.
13 Ці ж гэта не ад ГОСПАДА Магуцьцяў, што плямёны цяжка працуюць для агню, і людзі
стамляюцца марна?
14 Бо зямля напоўніцца веданьнем славы ГОСПАДА, як воды напаўняюць мора.
15 Гора таму, хто дае піць бліжняму свайму, наліваючы ў келіх, каб той упіўся, каб глядзець
на голасьць ягоную.
16 Ты напоўніўся ганьбаю замест славы; напіся таксама ты і пакажы неабрэзанасьць тваю.
Зьвернецца да цябе келіх правіцы ГОСПАДА, і ганьба — на славу тваю,
17 бо гвалт [твой над] Лібанам прыйдзе на цябе, і зьнішчэньне жывёлы спалохае цябе за кроў
людзкую і за гвалт над зямлёю, над горадам і над усімі, хто жыве ў ім.
18 Якая карысьць ад выявы, якую выразаў майстар, ад [ідала] літага, вучыцеля хлусьні, бо
спадзяецца стваральнік ягоны на працу сваю, робячы ідала нямога.
19 Гора таму, хто кажа дрэву: “Абудзіся”, [хто кажа] камяню, які маўчыць: “Устань!” Ці ён
можа навучыць? Вось, ён абкладзены золатам і срэбрам, але ніякага духу няма ў ім.
20 ГОСПАД — у сьвятыні сьвятасьці Сваёй. Няхай маўчыць перад Ім уся зямля!

Абк 3

1 Малітва Абакума прарока [для сьпяваньня], лямантуючы.
2 ГОСПАДЗЕ, я пачуў вестку Тваю, і спалохаўся. ГОСПАДЗЕ! Справу Тваю ў сярэдзіне гадоў
ажыві, у сярэдзіне гадоў зьяві, у гневе ўзгадай пра літасьць.
3 Бог ідзе з Тэману, і Сьвяты — з гары Паран. (Сэлях) Закрыла неба слава Ягоная, і хвала Ягоная
напоўніла зямлю.
4 І бляск [Ягоны] — як сьвятло; промні з рук Ягоных [выходзяць], там схаваная моц Ягоная.
5 Перад абліччам Ягоным ідзе пошасьць, і за стопамі Ягонымі крочыць жар палючы.
6 Ён стаў, і дрыжыць зямля; Ён глянуў, і трымцяць народы; і рассыпаліся горы вечныя,
схіліліся ўзгоркі спрадвечныя; шляхі Ягоныя — вечныя.
7 Я бачыў няправасьць у намётах Куша, дрыжэлі заслоны зямлі Мадыян.
8 Ці на рэкі загневаўся ГОСПАД, ці супраць рэк [палае] гнеў Твой? Ці супраць мора ярасьць
Твая, што Ты сеў на коняў Тваіх, на калясьніцы Твае пераможныя?
9 Цалкам аголены лук Твой, як Ты прысягнуў каленам [Ізраіля] словам [Тваім]. (Сэлях) Ты
рэкамі расьсек зямлю.
10 Убачыўшы Цябе, горы затрэсьліся; паводка рынула, бяздоньне дало голас свой, высока
падняўшы рукі свае.
11 Сонца і месяц спыніліся на месцы сваім; пры сьвятле стрэлаў Тваіх яны ішлі, пры бляску
зіхценьня дзіды Тваёй.
12 У абурэньні Ты крочыў па зямлі, у гневе малаціў народы.
13 Ты выйшаў, каб збавіць народ Твой, каб збавіць памазанца Твайго. Ты скрышыў галаву дому
бязбожніка, агаляючы падставы аж па шыю. (Сэлях)
14 Ты прабіў стрэламі ягонымі галаву правадыроў ягоных, калі [ўзьняліся], як віхура, каб
расьсеяць мяне; яны цешыліся як тыя, што пажэрлі ўбогага ўпотай.
15 Ты топчаш коньмі Тваімі мора, хваляваньне водаў вялікіх.
16 Я пачуў, і задрыжэла нутро маё, ад голасу [гэтага] затрымцелі вусны мае, гнілізна ўвайшла ў
косткі мае, і я калачуся на месцы сваім. Але я маю быць у супакоі ў дзень бедства, калі прыйдзе
на народ гэты той, хто пераможа [нас].

17 Бо хоць бы дрэва фігавае не расквітнела, і не было ўраджаю ў вінаградніку, [хоць бы] не
ўрадзіла аліўка [плоду свайго], і поле ня дала, што есьці, [хоць бы] зьніклі авечкі з абораў, і не
засталося валоў у хлявах,
18 але і тады я буду радавацца ў ГОСПАДЗЕ, буду цешыцца ў Богу збаўленьня майго.
19 ГОСПАД, Госпад — сіла мая, і Ён зробіць ногі мае як у аленя, і на вышыні мае ўзьвядзе мяне.
Кіраўніку хору: на струнных інструмэнтах.

КНІГА ПРАРОКА САФОНІІ

1 Слова ГОСПАДА, якое было да Сафоніі, сына Кушы, сына Гедаліі, сына Амарыі, сына Эзэкіі, у
дні Ёсіі, сына Амона, валадара Юды.
2 Зьбіраючы, забяру ўсё з аблічча зямлі, кажа ГОСПАД.
3 Забяру чалавека і скаціну, забяру птушак нябесных і рыбу марскую, і спакусы бязбожнікаў;
і зьнішчу чалавека з аблічча зямлі, кажа ГОСПАД.
4 І Я выцягну руку Маю на Юду і на ўсіх жыхароў Ерусаліму, і вынішчу з гэтага месца рэшткі
Баала, і імя службітоў паганскіх са сьвятарамі,
5 і тых, якія пакланяюцца на дахах войску нябеснаму, і тых, якія пакланяюцца і прысягаюць
на ГОСПАДА, і тых, якія прысягаюць на валадара свайго,
6 і тых, якія адступілі ад ГОСПАДА, і тых, якія не шукалі ГОСПАДА і не зьвярталіся да Яго.
7 Змоўкні перад абліччам Госпада ГОСПАДА, бо блізка дзень ГОСПАДА, бо прыгатаваў ГОСПАД
ахвяру, асьвяціў пакліканых Сваіх.
8 І станецца ў дзень ахвяры ГОСПАДА, Я наведаю князёў і сыноў валадара, і тых, якія апранаюць
адзеньне чужынскае.
9 І Я наведаю ў той дзень усіх, якія скачуць праз парог, якія напаўняюць дом гаспадара свайго
гвалтам і падманам.
10 І станецца ў той дзень, кажа ГОСПАД, [будзе] голас крыку ад Брамы Рыбнай, і бядаваньне —
з другога боку [гораду], і загуба вялікая — на ўзгорках.
11 Галасіце, жыхары Махтэшу, бо будзе выгублены ўвесь народ Ханаану, усе, хто адважвае
срэбра, будуць зьнішчаныя.
12 І станецца ў той час, што Я са сьвечкамі абшукаю Ерусалім і наведаю мужоў, якія задубелі
на дрожджах сваіх, якія кажуць у сэрцы сваім: «ГОСПАД ня робіць дабра і ня робіць ліха».
13 І станецца багацьце іхняе здабычай, а дамы іхнія будуць спустошаны. Яны пабудуюць дамы,
але ня будуць жыць у іх; і будуць садзіць вінаграднікі, але ня будуць піць віна з іх.
14 Блізка вялікі дзень ГОСПАДА, блізка ён і вельмі хутка [прыйдзе]. Голас дня ГОСПАДА. Тады
горка крычаць будзе волат.
15 Дзень гневу дзень гэты, дзень нядолі і бядоты, дзень загубы і спусташэньня, дзень цемры і
змроку, дзень хмары і імглы,
16 дзень рогу і гукаў трубных супраць гарадоў умацаваных і супраць вежаў высокіх.
17 І будуць уціскаць чалавека, і яны будуць хадзіць, як сьляпыя, бо яны зграшылі супраць
ГОСПАДА; і кроў іхняя будзе вылітая ў пыл, а ўнутранасьці іхнія — у гной.
18 Ані срэбра іхняе, ані золата іхняе ня зможа выратаваць іх у дзень гневу ГОСПАДА, але агнём
рэўнасьці Ягонай будзе зьедзена ўся зямля, бо загубу страшэнную Ён учыніць для жыхароў
зямлі гэтай.

Саф 2

1 Зьбярыцеся, зьбярыцеся, народзе бяз сораму,
2 перш, чым народзіцца пастанова і як мякіна праміне дзень, перш, чым прыйдзе на вас
ярасьць гневу ГОСПАДА, перш, чым прыйдзе на вас дзень гневу ГОСПАДА.
3 Шукайце ГОСПАДА, усе пакорныя зямлі, якія спаўняеце суд Ягоны; шукайце праведнасьці,
шукайце ўпакораныя. Можа, вы схаваецеся ў дзень гневу ГОСПАДА.
4 Бо Газа будзе пакінутая, і Ашкелон спустошаны, Ашдод апоўдні будзе выгнаны, і Экрон будзе
выкарэнены.
5 Гора жыхарам узьбярэжжа мора, народу Крыту! Слова ГОСПАДА на вас, Ханаан, зямля
Філістынцаў! Я зьнішчу цябе, што ня будзе каму жыць.
6 І будзе ўзьбярэжжа мора пашаю, жытлом для пастухоў і загарадкамі для авечак.
7 І будзе ўзьбярэжжа для рэшты дому Юды, будуць пасьвіць на ім, у дамах Ашкелону будуць
супачываць увечары, бо наведае іх ГОСПАД, Бог іхні, і верне палонных іхніх.

8 «Я чуў ганьбаваньні Маава і зьнявагі сыноў Амона, якімі яны зьневажалі народ Мой і
ўзьвялічваліся на мяжы іхняй.
9 Дзеля гэтага, як жывы Я, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Бог Ізраіля, Мааў будзе як Садом і сыны
Амона — як Гамора, месцам крапівы і капальняй солі, і пусткаю на вякі. Рэшта народу Майго
абрабуе іх, і пазасталыя з народу Майго возьмуць у спадчыну іх».
10 Гэта ім за пыху іхнюю, за тое, што яны зьневажалі і вывышаліся па-над народам ГОСПАДА
Магуцьцяў.
11 Страшны будзе ГОСПАД для іх, бо схуднеюць усе богі зямлі, і паклоніцца Яму кожны на
месцы сваім, усе астравы народаў.
12 І вы, Кушане, будзеце забітыя мячом Маім.
13 І Ён выцягне руку Сваю на поўнач, зьнішчыць Асірыю, і Ніневу зробіць пусткаю, сухой, як
пустыня.
14 І будуць ляжаць сярод яе чароды і ўсе жывёлы народаў, і пэлікан і вожык будуць начаваць на
аздобах ейных, голас іхні будзе гучаць з вокнаў; сухія [трэскі будуць] у парогах, бо адарвуць
кедравую [шалёўку ейную].
15 Гэта горад вясёлы, які жыве бясьпечна, які кажа ў сэрцы сваім: «Я, і няма больш [нікога]».
Вось, ён стаў пусткаю, логвішчам для зьвяроў! Кожны, хто праходзіць каля яго, сьвісьне і
махне рукою сваёй.

Саф 3

1 Гора бунтаўнічаму і заплямленаму гораду, прыгнятальніку.
2 Ня слухае голасу, не прыймае настаўленьня, на ГОСПАДА не спадзяецца, да Бога свайго не
набліжаецца.
3 Князі ягоныя сярод яго — ільвы, якія рыкаюць, судзьдзі ягоныя — ваўкі вечаровыя, якія не
пакідаюць [нічога] да раніцы.
4 Прарокі ягоныя — прайдзісьветы, людзі здрадлівыя, сьвятары ягоныя зьняважылі сьвятыню,
парушылі Закон.
5 ГОСПАД праведны пасярод яго, ня робіць беззаконьня; кожную раніцу Ён выдае на сьвятло
суд Свой, не спыняецца; але злачынца ня ведае сораму.
6 «Я зьнішчыў народы; зруйнаваў вежы іхнія; зрабіў пустымі вуліцы іхнія, ніхто ня ходзіць [па
іх]; спустошыў гарады іхнія, што [там] няма чалавека, няма жыхара [ў іх].
7 Я сказаў: “Толькі бойся Мяне, прыймі настаўленьне, і ня будзе зьнішчана сяліба твая, усё,
што Я наведаю ў цябе”. Але яны ўсталі раніцаю, каб псаваць усе ўчынкі свае.
8 Дзеля гэтага чакайце Мяне, кажа ГОСПАД, у дзень, калі Я паўстану, каб [узяць] здабычу, бо
на суд Мой Я зьбяру народы, зграмаджу валадарствы, каб выліць на іх абурэньне Маё, увесь
жар гневу Майго, бо агнём рэўнасьці Маёй будзе праглынута ўся зямля.
9 Бо тады Я вярну народам вусны чыстыя, каб усе клікалі імя ГОСПАДА, каб служылі Яму
поплеч.
10 З другога боку рэкаў Кушу [прыйдуць] тыя, якія пакланяюцца Мне; дачка расьцярушаных
Маіх прынясе Мне дары свае.
11 У той дзень ты ня будзеш саромецца за ўсе ўчынкі твае, якімі ты адступалася ад Мяне,
бо тады Я забяру сярод цябе тых, якія цешацца ў пыхлівасьці сваёй, і ты ня будзеш больш
вывышацца на сьвятой гары Маёй.
12 І Я пакіну сярод цябе народ бедны і ўбогі, і яны будуць мець надзею на імя ГОСПАДА.
13 Рэшта Ізраіля ня будзе рабіць беззаконьне і ня будзе гаварыць хлусьні, і ня знойдзецца ў
вуснах іхніх язык падманлівы, бо яны будуць пасьвіцца і супачываць, і ніхто ня будзе палохаць
[іх]».
14 Радуйся, дачка Сыёну! Усклікай, Ізраіль! Весяліся і цешся ўсім сэрцам, дачка Ерусаліму!
15 Адкінуў [ад цябе] ГОСПАД прысуды твае, разьвярнуў ворага твайго. Валадар Ізраіля, ГОСПАД
сярод цябе; ужо больш ня будзеш баяцца зла.
16 У той дзень скажуць Ерусаліму: «Ня бойся, Сыёне! Няхай не слабеюць рукі твае».

17 ГОСПАД, Бог твой, сярод цябе, Волат, Які збаўляе. Ён цешыцца з цябе ў радасьці, Ён супакоіць
[цябе] любоўю Сваёй, Ён будзе радавацца з цябе з ускліканьнем.
18 Тых, якія пакутуюць, што [няма] дзён сьвяточных, Я зьбяру. Цяжарам у цябе яны былі, на
іх была ганьба.
19 Вось, Я зраблю [канец] усім, хто прыгнятае цябе, у той час, і збаўлю кульгавую, і зьбяру
выгнаную, і зраблю іх хвалою і слаўным імем на ўсёй зямлі сораму іхняга.
20 У той час Я прывяду вас, і ў той час Я зьбяру вас, бо Я дам вам імя [слаўнае] і хвалу паміж
усімі народамі зямлі, калі вярну палонных вашых перад вачыма вашымі, кажа ГОСПАД.

КНІГА ПРАРОКА АГЕЯ

1 У другі год валадара Дарыя, у шосты месяц, у першы дзень месяца, было слова ГОСПАДА
праз Агея прарока да Зэрубабэля, сына Шэалтыэля, ваяводы Юды, і Егошуа, сына Егацадака,
сьвятара вялікага, кажучы:
2 «Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў, кажучы: “Гэты народ кажа: "Не прыйшоў час, час, каб
будаваць Дом ГОСПАДА"”».
3 І было слова ГОСПАДА праз Агея прарока, кажучы:
4 «А ці вам час жыць у дамах шаляваных, калі гэты Дом спустошаны?
5 Таму цяпер гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Зьвярніце сэрца вашае на шляхі вашыя.
6 Вы сееце шмат, але зьбіраеце мала; ясьцё, але вам ня досыць; п’яцё, але не праганяеце смагу;
апранаецеся, але вам ня цёпла; хто зарабляе плату, зарабляе для дзіравага капшука”.
7 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Зьвярніце сэрца вашае на шляхі вашыя.
8 Узыйдзіце на гару, і вазіце дрэва, і будуйце Дом [Божы]; і Я буду спагадаць яму, і ўслаўлюся,
кажа ГОСПАД.
9 Спадзяваліся, што будзе шмат, а вось, мала; і што прыносіце ў дом, Я тое разьвею. "Чаму?" —
кажа ГОСПАД Магуцьцяў. За Дом Мой, які спустошаны, а вы бяжыцё кожны да дому свайго.
10 Таму неба над вамі заставалася без расы, і зямля заставалася бяз плоду.
11 І Я паслаў суш на зямлю, і на горы, і на збожжа, і на вінаград, і на алей, і на тое, што выдае
зямля, і на людзей, і на быдла, і на ўсю працу рук”».
12 І паслухалі Зэрубабэль, сын Шэалтыэля, і Егошуа, сын Егацадака, сьвятар вялікі, і ўся рэшта
народу голас ГОСПАДА, Бога свайго, і словы Агея прарока, бо ГОСПАД, Бог іхні, паслаў яго, і
народ баяўся ГОСПАДА.
13 І сказаў Агей, пасланец ГОСПАДА, будучы пасланым ГОСПАДАМ да народу, кажучы: «Я з
вамі, кажа ГОСПАД».
14 І ўзрушыў ГОСПАД дух Зэрубабэля, сына Шэалтыэля, ваяводы Юды, і дух Егошуа, сына
Егацадака, сьвятара вялікага, і дух усёй рэшты народу, і яны прыйшлі, і рабілі работу ў Доме
ГОСПАДА Магуцьцяў, Бога свайго,
15 у дваццаць чацьвёрты дзень, у шосты месяц, у другі год валадара Дарыя.

Аг 2

1 У сёмы месяц, у дваццаць першы дзень месяца, было слова ГОСПАДА праз Агея прарока,
кажучы:
2 «Скажы цяпер Зэрубабэлю, сыну Шэалтыэля, ваяводзе Юды, і Егошуа, сыну Егацадака,
сьвятару вялікаму, і рэшце народу, кажучы:
3 “Хто застаўся між вамі, што бачылі Дом гэты ў першай славе ягонай? І якім вы бачыце яго
цяпер? Ці ня ёсьць ён у вачах вашых у параўнаньні з тым як нішто?
4 Але цяпер вось умацуйся, Зэрубабэлю, кажа ГОСПАД, і ўмацуйся, Егошуа, сын Егацадака,
сьвятар вялікі, і ўмацуйся, увесь народ зямлі, кажа ГОСПАД, і рабіце; бо Я з вамі, кажа ГОСПАД
Магуцьцяў.
5 Паводле слова, якім Я ўмовіўся з вамі, калі вы выйшлі з Эгіпту, Дух Мой сярод вас. Ня бойцеся.
6 Бо гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў: ‘Яшчэ раз, і неўзабаве, Я ўзварухну неба і зямлю, мора і
сухазем’е,
7 і ўзварухну ўсе народы, і прыйдзе жаданьне ўсіх народаў, і напоўню Дом гэты славаю, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў’.
8 Маё срэбра і Маё золата, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
9 Большая будзе слава гэтага Дому апошняга, чым першага, кажа ГОСПАД Магуцьцяў; і на
гэтым месцу Я дам супакой, кажа ГОСПАД Магуцьцяў”».
10 У дваццаць чацьвёрты дзень, у дзявяты месяц, у сёмы год Дарыя было слова ГОСПАДА да
Агея прарока, кажучы:

11 «Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Спытайся цяпер у сьвятароў пра Закон, кажучы:
12 "Калі хто нёс асьвячонае мяса ў крысе адзеньня свайго і дакрануўся крысом сваім да хлеба,
або да стравы, або да віна, або да алею, або да якой ежы, ці будуць яны асьвячоныя?""» І
сьвятары адказалі: «Не».
13 І сказаў Агей: «А калі занячышчаны нябожчыкам дакранецца да нечага з гэтых [рэчаў], ці
будуць яны нячыстымі?» І адказалі сьвятары, і сказалі: «Яны будуць нячыстымі».
14 І адказаў Агей, і сказаў: «Такія людзі гэтыя, і такі народ гэты перад абліччам Маім, кажа
ГОСПАД, і такая кожная праца рук іхніх. Тое, што яны прыносяць у ахвяру, — нячыстае.
15 А цяпер зьвярніце сэрцы вашыя адгэтуль і назад, перш, чым быў пакладзены камень на
камяні ў сьвятыні ГОСПАДА.
16 Было, што калі хто прыходзіў да капы ў дваццаць [мераў], было там дзесяць; і калі хто
прыходзіў да тоўчні, каб выціснуць пяцьдзясят [мераў] з тоўчні, было там дваццаць.
17 Я караў вас сушаю, і іржою, і градам усю працу рук вашых, але вы не навярнуліся да Мяне,
кажа ГОСПАД.
18 Зьвярніце сэрцы вашыя адгэтуль і назад, ад дваццаць чацьвёртага дня дзявятага месяца, ад
дня, у які закладзеная сьвятыня ГОСПАДА, зьвярніце сэрцы вашыя.
19 Ці ёсьць яшчэ насеньне ў сьвірне? Ці яшчэ вінаград, і дрэва фігавае, і дрэва гранатовае, і
дрэва аліўнае давалі плод? Ад гэтага дня Я дабраслаўлю».
20 І было слова ГОСПАДА другі раз да Агея ў дваццаць чацьвёрты дзень таго самага месяца,
кажучы:
21 «Скажы Зэрубабэлю, ваяводзе Юды, кажучы: “Я ўзварухну неба і зямлю;
22 Я перавярну пасады валадарстваў, і выгублю моц валадарстваў паганаў, і перавярну
калясьніцы і тых, якія едуць у іх, і паваляцца коні і вершнікі іхнія, кожны ад мяча брата свайго.
23 У той дзень, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Я вазьму цябе, Зэрубабэлю, сыне Шэалтыэля, слугу
Майго, кажа ГОСПАД, і зраблю цябе, як пячатку, бо Я выбраў цябе, кажа ГОСПАД Магуцьцяў”».

КНІГА ПРАРОКА ЗАХАРЫІ

1 У восьмым месяцы, у другім годзе Дарыя было слова ГОСПАДА да Захарыі, сына Бэрэхіі, сына
Іддо, прарока, кажучы:
2 «Загневаўся гневам ГОСПАД на бацькоў вашых.
3 І ты скажы ім: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Павярніцеся да Мяне, кажа ГОСПАД Магуцьцяў,
і Я павярнуся да вас, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
4 Ня будзьце як бацькі вашыя, да якіх клікалі прарокі, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
Адвярніцеся, прашу, ад шляхоў сваіх злых і ад учынкаў сваіх злых; але яны ня слухалі і не
зважалі на Мяне, кажа ГОСПАД”.
5 Бацькі вашыя, дзе яны? І прарокі ці жывуць вечна?
6 Толькі словы Мае і пастановы Мае, якія Я загадаў слугам Маім прарокам, ці не дасягалі
бацькоў вашых? І яны навярнуліся, і сказалі: “Як ГОСПАД Магуцьцяў думаў зрабіць нам
паводле шляхоў нашых і паводле ўчынкаў нашых, так і зрабіў нам”».
7 У дваццаць чацьвёрты дзень адзінаццатага месяца, гэта месяц Шэват, у другім годзе Дарыя
было слова ГОСПАДА да Захарыі, сына Бэрэхіі, сына Іддо, прарока, кажучы:
8 «Я бачыў у гэтую ноч; і вось, муж едзе на кані чырвоным, ён стаіць паміж міртаў, якія ў нізіне,
а за ім коні чырвоныя, рудыя і белыя.
9 І я сказаў: “Што гэта, Госпадзе мой?” І сказаў мне анёл, які гаварыў са мною: “Я пакажу табе,
што гэта”.
10 І адказаў муж, які стаяў паміж міртаў, і сказаў: “Гэта тыя, якіх паслаў ГОСПАД абыйсьці
зямлю”.
11 І адказалі яны анёлу ГОСПАДА, які стаяў паміж міртаў, і сказалі: “Мы абыйшлі зямлю, і вось,
уся зямля заселеная і ў супакоі”.
12 І адказаў анёл ГОСПАДА, і сказаў: “ГОСПАДЗЕ Магуцьцяў, калі Ты зьлітуешся над Ерусалімам
і над гарадамі Юды, на якія Ты гневаешся ўжо семдзясят гадоў?”
13 І адказаў ГОСПАД анёлу, які гаварыў са мною, словы добрыя, словы пацяшальныя.
14 І сказаў мне анёл, які гаварыў са мною: “Клікай, кажучы: "Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Я
раўную пра Ерусалім і пра Сыён рэўнасьцю вялікай.
15 І гневам вялікім Я гневаюся на народы, якія ў супакоі, бо Я загневаўся крыху, а яны
дапамагалі [рабіць] зло"”.
16 Дзеля гэтага кажа ГОСПАД: “Я зьвярнуся да Ерусаліму з літасьцю. Дом Мой будзе
адбудаваны ў ім, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і меральны шнур будзе расьцягнуты над
Ерусалімам”.
17 І зноў клікай, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Зноўку напоўняцца гарады Мае
дабром, і зноў пацешыць ГОСПАД Сыён, і выбярэ ізноў Ерусалім”.
18 І ўзьняў я вочы мае, і ўбачыў, і вось, чатыры рогі.
19 І я сказаў анёлу, які гаварыў са мною: “Што гэта?” І ён сказаў мне: “Гэта рогі, якія раскідалі
Юду, Ізраіля і Ерусалім”.
20 І паказаў мне ГОСПАД чатырох рамесьнікаў.
21 І я сказаў: “Што яны прыходзяць рабіць?” І Ён сказаў, кажучы: “Гэта рогі, якія раскідалі Юду,
так што ніхто не падняў галавы сваёй. А яны прыйшлі, каб стрывожыць іх, каб скрышыць рогі
народаў, якія паднялі рог супраць зямлі Юды, каб раскідаць яе”.

Зах 2

1 І ўзьняў я вочы мае, і ўбачыў, і вось, муж, і ў руцэ ягонай меральны прут.
2 І я сказаў: “Куды ты ідзеш?” А ён сказаў мне: “Мераць Ерусалім, каб убачыць, якая шырыня
ягоная і якая даўжыня ягоная”.
3 І вось, анёл, які гаварыў са мною, выходзіць, і другі анёл выходзіць насустрач яму,

4 і сказаў яму: “Бяжы, прамоў да юнака гэтага, кажучы: ‘Ерусалім будзе заселены па-за мурамі
з прычыны мноства людзей і скаціны ў ім.
5 І Я буду для яго, кажа ГОСПАД, вогненным мурам вакол [яго], і буду славаю пасярод яго’ ”.
6 Гора, гора! Уцякайце з зямлі паўночнай, кажа ГОСПАД, бо на чатыры вятры нябесныя Я
расьцярушу вас, кажа ГОСПАД.
7 Гора! Уцякай на Сыён тая, якая жывеш у дачкі Бабілону.
8 Бо гэта сказаў ГОСПАД Магуцьцяў: “Дзеля славы [Сваёй] Ён паслаў мяне да народаў, якія
рабавалі вас, бо хто дакранаецца да вас, дакранаецца да зрэнкі вока Ягонага.
9 І вось Я махну рукою Маёй на іх, і яны будуць здабычай для слугаў сваіх, і даведаецеся, што
ГОСПАД Магуцьцяў паслаў мяне.
10 Весяліся і радуйся, дачка Сыёну, бо вось, Я прыходжу і буду жыць пасярод цябе, кажа
ГОСПАД.
11 І далучыцца шмат народаў да ГОСПАДА ў той дзень і будуць Мне народам, і Я буду жыць
пасярод цябе, і ты даведаешся, што ГОСПАД Магуцьцяў паслаў мяне да цябе.
12 І ўспадкаеміць ГОСПАД Юду, частку Сваю ў зямлі сьвятой, і зноў выбярэ Ерусалім”.
13 Няхай змоўкне ўсякае цела перад абліччам ГОСПАДА, бо Ён паўстаў са сьвятой сялібы Сваёй.

Зах 3

1 І Ён паказаў мне Егошуа, сьвятара вялікага, які стаяў перад абліччам анёла ГОСПАДА, і
шатана, які стаў праваруч яго, каб супрацьстаяць яму.
2 І сказаў ГОСПАД шатану: “Няхай утаймуе цябе ГОСПАД, шатан, няхай утаймуе цябе ГОСПАД,
Які абраў Ерусалім. Ці не галавешка гэта, выхапленая з агню?”
3 Егошуа быў апрануты ў адзеньне запэцканае і стаяў перад абліччам анёла.
4 І Ён адказаў, і сказаў да тых, якія стаялі перад абліччам Ягоным, кажучы: “Здыміце з яго
адзеньне запэцканае”. А яму сказаў: “Глядзі, Я зьняў з цябе беззаконьне тваё, і апрануў цябе
ў шаты ўрачыстыя”.
5 І сказаў: “Няхай ускладуць мітру чыстую на галаву ягоную”. І ўсклалі мітру чыстую на галаву
ягоную, і апранулі яго ў шаты. А анёл ГОСПАДА стаяў.
6 І папярэдзіў анёл ГОСПАДА Егошуа, кажучы:
7 “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Калі будзеш хадзіць па шляхах Маіх, і калі будзеш захоўваць
загады Мае, тады таксама будзеш судзіць дом Мой, і захоўваць панадворкі Мае, і Я дам табе
хадзіць паміж тых, якія стаяць [тут].
8 Паслухай, прашу, Егошуа, сьвятар вялікі, ты і бліжнія твае, якія сядзяць перад абліччам тваім,
бо яны — мужы, [якім будзе] знак. Бо вось, Я прывяду слугу Майго, Парастка.
9 Бо вось камень, які Я паклаў перад абліччам Егошуа; на адным камяні — сем вачэй. Вось, Я
выражу на ім рэзьблены [надпіс], кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і аддалю беззаконьне зямлі гэтай
за адзін дзень.
10 У той дзень, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, будзеце клікаць адзін аднаго, [каб сядзець] пад
вінаграднай лазой і пад дрэвам фігавым”.

Зах 4

1 І павярнуўся той анёл, які гаварыў са мною, і пабудзіў мяне, як чалавека, якога будзяць зо
сну ягонага,
2 і сказаў мне: “Што ты бачыш?” І я сказаў, кажучы: “Бачу, і вось, сьвечнік, увесь з золата, і
чара на версе ягоным, і сем лямпаў ягоных на ім, і сем рурак да лямпаў, якія на версе ягоным,
3 і дзьве аліўкі каля яго: адна — з правага боку чары, а другая з левага боку яе”.
4 І я адказаў, і сказаў анёлу, які гаварыў са мною: “Што гэта, пане мой?”
5 І адказаў анёл, які гаварыў са мною, і сказаў мне: “Хіба ты ня ведаеш, што гэта?” І я сказаў:
“Не, пане мой”.
6 І ён адказаў, і сказаў мне, кажучы: “Гэта слова ГОСПАДА да Зэрубабэля, якое кажа: ‘Ня сілаю,
і ня моцаю, але Духам Маім, кажа ГОСПАД Магуцьцяў’.

7 Хто ты, гара вялікая? Перад абліччам Зэрубабэля [ты будзеш] раўніна, і ён прынясе камень
вуглавы з гуканьнямі: ‘[Няхай знойдзе] ласку, [няхай будзе] ласка для яго!’ ”
8 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
9 “Рукі Зэрубабэля заклалі Дом гэты, і рукі ягоныя скончаць [яго]; і ты даведаешся, што ГОСПАД
Магуцьцяў паслаў мяне да вас.
10 Бо тыя, якія пагарджалі днём малых [пачаткаў], будуць радавацца і ўбачаць адвес з волава
ў руцэ Зэрубабэля. А гэтыя сем — вочы ГОСПАДА, якія абыходзяць усю зямлю”.
11 І я адказаў, і сказаў яму: “Што гэта за дзьве аліўкі з правага боку сьветача і з левага боку
ягонага?”
12 І я адказаў другі раз, і сказаў яму: “Што гэта за дзьве галінкі аліўныя, якія праз дзьве залатыя
руркі выліваюць золата з сябе?”
13 І ён сказаў мне, кажучы: “Хіба ты ня ведаеш, што гэта?” І я сказаў: “Не, пане мой!”
14 І ён сказаў: “Гэта два сыны алівы, якія стаяць перад ГОСПАДАМ усёй зямлі”.

Зах 5

1 І я павярнуўся, і ўзьняў вочы мае, і ўбачыў, і вось, скрутак, які ляціць.
2 І ён сказаў мне: “Што ты бачыш?” І я адказаў: “Бачу скрутак, які ляціць. Даўжыня ягоная —
дваццаць локцяў, а шырыня ягоная — дзесяць локцяў”.
3 І ён сказаў мне: “Гэта праклён, які выходзіць на аблічча зямлі; бо кожны, хто крадзе, паводле
[напісанага] гэтага будзе зьнішчаны, і кожны, хто прысягае [фальшыва], паводле [напісанага]
гэтага будзе зьнішчаны.
4 Я навяду [праклён], кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і ён прыйдзе ў дом злодзея і ў дом таго, хто
прысягае ў імя Маё хлусьліва, і заначуе ў сярэдзіне дому ягонага, і выгубіць яго, і дрэва ягонае,
і камяні ягоныя”.
5 І выйшаў анёл, які гаварыў са мною, і сказаў мне: “Узьнімі, прашу, вочы Твае і паглядзі, што
гэта выходзіць”,
6 І я сказаў: “Што гэта?” І ён сказаў: “Гэта эфа выходзіць”. І сказаў: “Гэта вока іхняе ў-ва ўсёй
зямлі”.
7 І вось накрыўка з волава паднялася, і вось, жанчына нейкая сядзіць у сярэдзіне эфы.
8 І ён сказаў: “Гэта нягоднасьць”; і кінуў яе ў сярэдзіну эфы, і кінуў кавалак волава на адтуліну
ейную.
9 І я ўзьняў вочы мае, і глядзеў, і вось, дзьве жанчыны ходзяць, і вецер [быў] у крылах іхніх, і
гэтыя крылы — як крылы бусла; і яны паднялі эфу паміж зямлёй і небам.
10 І я сказаў анёлу, які гаварыў са мною: “Куды яны нясуць эфу гэтую?”
11 І ён сказаў мне: “Каб пабудаваць ёй дом у зямлі Шынаар, і ён будзе падрыхтаваны, і яе
паставяць там на месца ейнае”.

Зах 6

1 І я павярнуўся, і ўзьняў вочы мае, і глядзеў, і вось, чатыры калясьніцы выяжджаюць паміж
двух гор; і горы тыя — горы мядзяныя.
2 У першай калясьніцы коні чырвоныя, а ў другой калясьніцы коні чорныя;
3 а ў трэцяй калясьніцы коні белыя, а ў чацьвёртай калясьніцы коні стракатыя, [усе яны]
моцныя.
4 І я адказаў, і сказаў анёлу, які гаварыў са мною: “Што гэта, пане мой?”
5 І адказаў анёл, і сказаў мне: “Гэта чатыры духі нябесныя, якія выходзяць пасьля стаяньня
перад Госпадам усёй зямлі.
6 Той, у якога коні чорныя, ідуць у зямлю паўночную, а [коні] белыя ідуць за імі, а [коні]
стракатыя ідуць у зямлю паўднёвую”.
7 І выйшлі [коні] моцныя, і шукалі, каб ісьці па зямлі. І ён сказаў: “Ідзіце, прайдзіце па зямлі”,
і яны прайшлі па зямлі.
8 І ўсклікнуў ён да мяне, і прамовіў да мяне, кажучы: “Глядзі, тыя, якія пайшлі ў зямлю
паўночную, супакоілі Дух Мой у зямлі паўночнай”.

9 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
10 “Вазьмі [дары] ў тых, [якія прыйшлі], у Хэлдая, і ў Товіі, і ў Едаі, якія прыйшлі з Бабілону, і
прыйдзеш у той самы дзень, і пойдзеш у дом Ёшыі, сына Сафоніі.
11 І возьмеш срэбра і золата, і зробіш кароны, і ўложыш на галаву Егошуа, сына Егацадака,
сьвятара вялікага,
12 і скажаш яму, кажучы: “Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў, кажучы: ‘Вось Муж, Парастак імя
Ягонае, і Ён вырасьце з месца Свайго, і пабудуе сьвятыню ГОСПАДА.
13 І Ён пабудуе сьвятыню ГОСПАДА, і будзе насіць славу, і сядзе, і будзе панаваць на пасадзе
Сваім, і будзе сьвятаром на пасадзе Сваім, і рада супакою будзе паміж імі абодвума’ ”.
14 А тыя кароны будуць для Хэлема, для Товіі, для Едаі і для Хэны, сына Сафоніі, як памятка ў
сьвятыні ГОСПАДА.
15 І далёкія прыйдуць, і будуць будаваць сьвятыню ГОСПАДА; і вы даведаецеся, што ГОСПАД
Магуцьцяў паслаў мяне да вас. І гэта станецца, калі вы слуханьнем слухаць будзеце голас
ГОСПАДА, Бога вашага».

Зах 7

1 І сталася ў чацьвёртым годзе валадара Дарыя, і было слова ГОСПАДА да Захарыі ў чацьвёрты
дзень дзявятага месяца Кісьлеў.
2 І паслалі з Бэтэля Шарэцэра і Рэгэм-Мэлеха і людзей іхніх маліць аблічча ГОСПАДА,
3 каб сказаць сьвятарам, якія ў Доме ГОСПАДА Магуцьцяў, і прарокам, кажучы: «Ці маю я
плакаць у пятым месяцы з пасьвячэньнем, як я рабіў гэта шмат гадоў?»
4 І было да мяне слова ГОСПАДА Магуцьцяў, кажучы:
5 «Кажы ўсяму народу і сьвятарам, кажучы: “Калі вы посьцілі і былі ў жалобе ў пятым і ў сёмым
месяцы гэтыя семдзясят гадоў, ці вы для Мяне постам посьцілі?
6 І калі вы елі, і калі пілі, ці ж ня дзеля сябе вы елі і пілі?
7 Ці ж [гэта] ня тыя словы, якія абвясьціў ГОСПАД праз рукі прарокаў ранейшых, калі Ерусалім
быў заселены і ў супакоі, і гарады ягоныя вакол яго, і Нэгеў, і Шэфэля былі заселеныя?”»
8 І было слова ГОСПАДА да Захарыі, кажучы:
9 «Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў, кажучы: “Судзіце суд паводле праўды і будзьце літасьцівыя
кожны да брата свайго.
10 І ўдавы, і сіраты, і прыхадня, і беднага не ўціскайце, і зла ня думайце супраць брата свайго
ў сэрцы сваім”.
11 Але яны адмовіліся прыхіліць вуха і павярнуліся бунтоўна сьпінаю, і вушы свае зрабілі
цяжкімі, каб ня чуць,
12 і сэрцы свае зрабілі як крэмень, каб ня чуць Закону і словаў, якія пасылаў ГОСПАД Магуцьцяў
Духам Сваім праз рукі прарокаў; і быў гнеў вялікі ад ГОСПАДА Магуцьцяў.
13 “І сталася, што калі Я клікаў, яны ня чулі. Так і яны будуць клікаць, і Я ня буду чуць, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў.
14 І Я разьвеяў іх паміж усіх народаў, якіх яны ня ведалі, і зямля спустошаная пасьля іх, ажно
няма нікога, хто б праходзіў ці вяртаўся. І яны ператварылі зямлю жаданую ў пустэчу”».

Зах 8

1 І было слова ГОСПАДА Магуцьцяў, кажучы:
2 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Я раўную пра Сыён рэўнасьцю вялікай і з гневам вялікім Я
раўную пра яго.
3 Гэта кажа ГОСПАД. Я вярнуся на Сыён і буду жыць у Ерусаліме, і будзе называцца Ерусалім
горадам праўды, а гара ГОСПАДА Магуцьцяў — гарою сьвятой.
4 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Зноў будуць сядзець старыя на плошчах Ерусаліму, кожны і
кожная з кійком сваім у руцэ сваёй з прычыны мноства дзён.
5 І плошчы гораду гэтага напоўняцца хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія гуляюць на плошчах
ягоных.

6 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Калі гэта [выглядае] цудам у вачах рэшты народу гэтага ў дні
гэтыя, няўжо таксама гэта будзе цудам у вачах Маіх? — кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
7 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Вось, Я выратую народ Мой з зямлі ўсходу і з зямлі заходу
сонца,
8 і прывяду іх, і яны будуць жыць у Ерусаліме, і будуць Мне народам, а Я буду ім Богам у
праўдзе і праведнасьці.
9 Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Умацуйце рукі вашыя вы, якія чуеце ў дні гэтыя словы гэтыя
з вуснаў прарокаў, якія былі ў дзень закладаньня Дому ГОСПАДА Магуцьцяў, сьвятыні, якую
будавалі.
10 Бо перад днямі гэтымі не было платы для чалавека і не было платы для скаціны; і для
таго, хто выходзіў, і для таго, хто ўваходзіў, не было супакою ад прыгнятальніка, бо Я паслаў
кожнага чалавека супраць бліжняга ягонага.
11 А цяпер не такі, як у дні ранейшыя, Я [буду] для рэшты народу, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
12 Бо [будзе] насеньне супакою, вінаграднік дасьць плод свой, і зямля дасьць ураджай свой, і
неба дасьць расу сваю, і Я дам у спадчыну рэшце народу гэтага ўсё гэта.
13 І станецца, што як вы былі праклёнам сярод народаў, дом Юды і дом Ізраіля, так Я выбаўлю
вас, і вы будзеце дабраславенствам. Ня бойцеся, няхай умацуюцца рукі вашыя!
14 Бо гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў: “Як Я задумаў рабіць вам зло, калі бацькі вашыя гнявілі
Мяне, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і не шкадаваў [пра гэта],
15 так Я павярнуўся і задумаў у гэтыя дні рабіць дабро Ерусаліму і дому Юды. Ня бойцеся!
16 Гэта рэчы, якія маеце рабіць: гаварыце праўду адзін аднаму, [паводле] праўды і суду
супакою судзіце ў брамах вашых,
17 і няхай ніхто з вас не надумвае зла для бліжняга свайго, і прысягі фальшывай не любіце, бо
ўсё гэта Я ненавіджу, кажа ГОСПАД”».
18 І было слова ГОСПАДА да мяне, кажучы:
19 «Гэта кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Пост чацьвёртага і пост пятага, і пост сёмага, і пост дзясятага
[месяца] будзе для дому Юды радасьцю і вясёласьцю, і сьвятам добрым. І любіце праўду і
супакой!
20 Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Зноў прыйдуць народы, і жыхары мноства гарадоў.
21 І пойдуць жыхары аднаго гораду да [жыхароў] другога, кажучы: “Пойдзем, пайшоўшы,
маліць аблічча ГОСПАДА і шукаць ГОСПАДА Магуцьцяў. Пайду таксама я!”
22 І прыйдуць шмат народаў і народы магутныя шукаць ГОСПАДА Магуцьцяў у Ерусаліме і
маліць аблічча ГОСПАДА.
23 Гэтак кажа ГОСПАД Магуцьцяў. У тыя дні схопяць дзесяць чалавек з усіх моваў народаў,
схопяць за крысо Юдэя, кажучы: “Мы пойдзем з вамі, бо мы чулі, [што] з вамі Бог”».

Зах 9

1 Цяжар слова ГОСПАДА на зямлю Хадрах і на Дамаск, супачынак Ягоны, бо вока ГОСПАДА —
на чалавека і на ўсе калены Ізраіля,
2 і на Хамат таксама, які мяжуе з ім, Тыр і Сідон, бо ён стаў надта мудрым.
3 І пабудаваў сабе Тыр горад умацаваны, і назьбіраў срэбра, як пылу, і шчырага золата — як
балота вулічнага.
4 Вось, Госпад зруйнуе яго і кіне ў мора багацьце ягонае, і ён будзе зьедзены агнём.
5 Убачыць [гэта] Ашкелон і спалохаецца, і Газа, і вельмі задрыжыць, і Экрон, бо будзе
асаромлена спадзяваньне ягонае, і згіне валадар у Газе, і Ашкелон будзе незаселены.
6 І будзе жыць байструк у Ашдодзе, і Я зьнішчу пыху Філістынцаў,
7 і выкіну кроў ягоную з роту ягонага, і брыдоты ягоныя — спаміж зубоў ягоных; і ён таксама
застанецца для Бога нашага, і ён будзе як князь у Юдзе, а Экрон — як Евусэй.
8 І Я стану табарам каля Дому Майго супраць войска, супраць таго, хто праходзіць, і супраць
таго, хто вяртаецца, і ня пройдзе больш праз іх прыгнятальнік, бо цяпер Я буду бачыць [гэта]
вачыма Маімі.

9 Радуйся моцна, дачка Сыёну, усклікай, дачка Ерусаліму. Вось, Валадар твой прыходзіць да
цябе, Ён праведны і збаўляе, Ён пакорны і сядзіць на асьле і на асьляняці, сыне асьліцы.
10 Я вынішчу калясьніцы ў Эфраіма і коней у Ерусаліме, і будзе зьнішчаны лук баявы. І Ён
прамовіць пра супакой народам, і ўлада Ягоная — ад мора аж да мора і ад ракі аж да канцоў
зямлі.
11 А што да цябе, праз кроў запавету твайго Я выпушчу вязняў тваіх з ямы, у якой няма вады.
12 Вярніцеся ў крэпасьць, вязьні надзеі! Таксама сёньня паведамляю, што падвойна
аднагароджу табе,
13 бо Я нацягну Юду да Сябе як лук, напоўню [сагайдак] Эфраімам і ўзьніму сыноў тваіх, Сыёне,
супраць сыноў тваіх, Яване, і зраблю цябе як меч волата.
14 І ГОСПАД зьявіцца над імі, і выляціць, як маланака, страла Ягоная, і Госпад ГОСПАД задзьме
ў рог, і выйдзе як бура паўднёвая.
15 ГОСПАД Магуцьцяў будзе бараніць іх, і яны пажруць і патопчуць камяні для кіданьня, і
будуць піць, і будуць раўсьці, нібы ад віна, і напоўняцца [крывёю] як чаша [ахвярная], як рагі
ахвярніка.
16 І збавіць іх ГОСПАД, Бог іхні, у той дзень, як авечак [збавіць] народ Свой; бо яны будуць як
камяні [каштоўныя] ў дыядэме, якія зьзяюць у зямлі Ягонай.
17 Якая добрасьць Ягоная, і якая прыгажосьць Ягоная! Збожжа дасьць расьці юнакам, і маладое
віно — дзяўчатам.

Зах 10

1 Прасіце ў ГОСПАДА дождж у час позьняга дажджу. ГОСПАД блісьне маланкаю і дасьць залеву
дажджу, [дасьць] кожнаму траву ў полі.
2 Бо балваны гавораць беззаконьне, і прадказальнікі бачаць хлусьню і распавядаюць пра сны
марныя, пацяшаюць марнасьцю. Дзеля гэтага яны бадзяюцца, як авечкі; яны прыгнечаныя, бо
няма пастыра.
3 На пастыраў Я загневаўся гневам Маім, і казлоў Я наведаю, бо наведае ГОСПАД Магуцьцяў
чараду Сваю, дом Юды, і паставіць іх, як слаўнага каня Свайго на бітву.
4 З яго — кутні [камень], з яго — калок [намёту], з яго — лук баявы, з яго выйдуць усе кіраўнікі
разам.
5 І яны будуць, як волаты, якія топчуць вулічнае балота ў бітве, і будуць ваяваць, бо ГОСПАД з
імі, і асаромяць вершнікаў на конях.
6 І Я ўмацую дом Юды, і дом Язэпа выбаўлю, і вярну іх; бо Я зьлітуюся над імі, і яны будуць,
быццам Я не кідаў іх, бо Я — ГОСПАД, Бог іхні, і Я адкажу ім.
7 І будзе Эфраім, як волат, і ўзрадуецца сэрца іхняе, як ад віна. І сыны іхнія ўбачаць і
ўзрадуюцца; сэрца іхняе будзе цешыцца ў ГОСПАДЗЕ.
8 Я засьвішчу ім і зьбяру іх, бо Я адкупіў іх, і яны будуць множыцца, як множыліся [раней].
9 І Я расьсею іх паміж народамі, але ў [зямлі] далёкай яны будуць узгадваць Мяне, і будуць
жыць з сынамі сваімі, і вернуцца.
10 І Я вярну іх з зямлі Эгіпецкай, і з Асірыі зьбяру іх, і ў зямлю Гілеад і на Лібан прывяду іх, і ня
[будзе хапаць] месца для іх.
11 І ён пройдзе праз мора нядолі, і разаб'е хвалі марскія, і высахнуць усе глыбіні ракі, і ўпадзе
пыхлівасьць Асірыі, і скіпетр Эгіпту будзе забраны.
12 І Я ўмацую іх у ГОСПАДЗЕ, і ў імя Ягонае яны будуць хадзіць, кажа ГОСПАД.

Зах 11

1 Адчыні, Лібане, дзьверы свае, і пажарэ агонь кедры твае.
2 Галасі, кіпарысе, бо кедр упаў, бо слаўныя зруйнаваныя; галасіце, дубы Башану, бо паваліўся
лес непраходны.
3 Голас ляманту пастухоў, бо гонар іхні зруйнаваны; голас рыканьня львянятаў, бо
зруйнаваная веліч Ярдану.
4 Гэтак кажа ГОСПАД, Бог мой: «Пасьві авечкі, [якія] на зарэз,

5 якіх рэжуць тыя, якія купляюць [іх], і не вінаватыя, а тыя, што прадаюць іх, кажуць:
“Дабраслаўлёны ГОСПАД, што я ўзбагацеў!” І пастухі іхнія не шкадуюць іх.
6 Бо Я ня буду болей шкадаваць жыхароў зямлі, кажа ГОСПАД. І вось, Я аддам чалавека,
кожнага ў руку бліжняга ягонага і ў руку валадара ягонага, і яны будуць таўчы зямлю, і Я
ня вызвалю з рукі іхняй».
7 І я пачаў пасьвіць авечак, [якія] на зарэз, бедных авечак. І я ўзяў сабе два кіі. Адзін я назваў
“Хараство”, а другі назваў “Згода”, і пасьвіў авечак.
8 І я прыбраў трох пастухоў за адзін месяц, і адвярнулася душа мая ад іх, і таксама душа іхняя
грэбуе мною.
9 І я сказаў: «Ня буду пасьвіць вас. Тая, што мае памерці, няхай памірае, і тая, што мае загінуць,
няхай гіне, а пазасталыя няхай ядуць цела адна адной».
10 І я ўзяў кій свой “Хараство”, і зламаў яго, каб разарваць запавет мой, які я заключыў з усімі
народамі.
11 І ён быў разарваны ў той дзень, і гэтак даведаюцца бедныя авечкі, якія пільнуюцца мяне,
што гэта — слова ГОСПАДА.
12 І я сказаў ім: “Калі [гэта] добра ў вачах вашых, дайце плату маю; а калі не, пакіньце [сабе]”.
І яны адважылі плату маю — трыццаць срэбнікаў.
13 І сказаў мне ГОСПАД: «Кінь іх для ганчара, ладная цана, якою яны ацанілі Мяне!» І я ўзяў
трыццаць срэбнікаў, і кінуў іх у Доме ГОСПАДА для ганчара.
14 І я зламаў другі кій свой — “Згоду”, каб разарваць братэрства паміж Юдам і Ізраілем.
15 І сказаў ГОСПАД мне: «Зноў вазьмі сабе рэчы пастуха бязглуздага.
16 Бо вось, Я пастаўлю ў зямлі пастуха, які [авечкі], якая прападае, не наведае, згубленай ня
будзе шукаць, пакалечанай ня будзе лячыць, здаровай ня будзе карміць, але мяса сытых будзе
есьці і капыты іхнія будзе адрываць.
17 Гора пастуху нягоднаму, які пакідае авечак! Меч на рамяно ягонае і на правае вока ягонае!
Рамяно ягонае сухасьцю ссохне, і правае вока ягонае цемраю зацемрыцца».

Зах 12

1 Цяжар слова ГОСПАДА пра Ізраіля. Кажа ГОСПАД, Які расьцягнуў неба, і заснаваў зямлю, і
ўкшталтаваў дух чалавека ў нутры ягоным.
2 Вось, Я зраблю Ерусалім келіхам хістаньня для ўсіх народаў навокал, і таксама будзе для
Юды, калі будуць аблягаць Ерусалім.
3 І станецца ў той дзень, што Я зраблю Ерусалім цяжкім камянём для ўсіх народаў. Усе, якія
будуць падымаць яго, калецтвам скалечацца, і зьбяруцца супраць яго ўсе народы зямлі.
4 У той дзень, кажа ГОСПАД, Я ўдару кожнага каня жахам, а вершніка ягонага — шаленствам;
і на дом Юды Я адкрыю вочы Мае, а ўсіх коней народаў Я ўдару сьлепатою.
5 І скажуць князі Юды ў сэрцы сваім: «Сіла для жыхароў Ерусаліму — у ГОСПАДЗЕ Магуцьцяў,
Богу іхнім».
6 У той дзень Я зраблю князёў Юды як казан з агнём сярод дроваў і як паходню запаленую сярод
снапоў, і яны пажаруць справа і зьлева ўсе народы навокал, і Ерусалім будзе зноў населены на
месцы сваім, у Ерусаліме.
7 І збавіць ГОСПАД спачатку намёты Юды, каб не вывышалася слава дому Давіда і слава
жыхароў Ерусаліму па-над Юду.
8 У той дзень будзе бараніць ГОСПАД жыхароў Ерусаліму, і той, які спатыкаецца сярод іх, у той
дзень будзе як Давід, а дом Давіда будзе як Бог, як анёл ГОСПАДА перад абліччам іхнім.
9 І станецца ў той дзень, што Я буду шукаць, каб зьнішчыць усе тыя народы, якія выйдуць
супраць Ерусаліму.
10 І Я выльлю на дом Давіда і на жыхароў Ерусаліму Дух ласкі і маленьня, і яны будуць глядзець
на Таго, Якога яны прабілі, і будуць галасіць па Ім, як галосяць па адзіным [сыне], і будуць
горка плакаць па Ім, як горка плачуць па першародным.
11 У той дзень будзе вялікае галашэньне ў Ерусаліме, як галашэньне Гадад-Рымона ў даліне
Мэгідо.

12 І зямля будзе галасіць, кожная сям'я асобна: сям'я дому Давіда асобна, і жанчыны іхнія
асобна; сям'я дому Натана асобна, і жанчыны іхнія асобна;
13 сям'я дому Левія асобна, і жанчыны іхнія асобна; сям'я Шымэя асобна, і жанчыны іхнія
асобна,
14 усе сем'і, якія засталіся, кожная сям'я асобна, і жанчыны іхнія асобна.

Зах 13

1 У той дзень адчыніцца крыніца для дому Давіда і для жыхароў Ерусаліму дзеля [абмыцьця]
грэху і нячыстасьці.
2 І станецца ў той дзень, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Я вынішчу імёны ідалаў з зямлі, і ня будуць
іх болей узгадваць, і таксама прарокаў [фальшывых] і духа нячыстага Я выганю з зямлі.
3 І станецца, калі нехта будзе яшчэ прарочыць [хлусьліва], тады бацька ягоны і маці ягоная,
якія нарадзілі яго, скажуць яму: «Ты ня маеш жыць, бо ты гаворыш хлусьню ў імя ГОСПАДА»;
і праб'юць яго [мячом] бацька ягоны і маці ягоная, якія нарадзілі яго, за тое, што ён [хлусьню]
прарочыць.
4 І станецца ў той дзень, што засаромеюцца прарокі, кожны за відзеж свой, калі прарочылі яны,
і ня будуць апранаць кажух касматы, каб ашукваць.
5 І скажа ён: «Я — не прарок, я — чалавек, які абрабляе зямлю, бо зямля — набытак мой з
маладосьці маёй».
6 І скажуць яму: «Што гэта за раны на руках тваіх?» І ён скажа: «Паранілі мяне ў доме тых,
якія любяць мяне».
7 Абудзіся, меч, на Пастыра Майго і на Мужа, Які блізкі Мне, кажа ГОСПАД Магуцьцяў. Удар
пастыра, і расьсеюцца авечкі! І Я павярну руку Маю на ягнятак.
8 І станецца на ўсёй зямлі, кажа ГОСПАД, што дзьве часткі на ёй будуць вынішчаны, загінуць,
а трэцяя [частка] застанецца на ёй.
9 І Я правяду гэтую трэцюю [частку] праз агонь, і ачышчу іх, як ачышчаюць срэбра, і выспрабую
іх, як выпрабоўваюць золата. Ён будзе клікаць імя Маё, і Я адкажу яму і скажу: «Гэта народ
Мой», і ён скажа: «ГОСПАД — [гэта] Бог мой!»

Зах 14

1 Вось, надыходзіць дзень ГОСПАДА, і падзеляць здабычу тваю пасярод цябе.
2 І Я зьбяру ўсе народы супраць Ерусаліму на бітву, і горад будзе здабыты, і дамы будуць
разрабаваныя, і жанчыны будуць зьняслаўленыя, і палова гораду пойдзе ў палон, але рэшта
народу ня будзе вынішчана з гораду.
3 І выйдзе ГОСПАД, і будзе ваяваць з народамі гэтымі, як у дзень змаганьня Ягонага, як у дзень
бітвы.
4 І стануць ногі Ягоныя ў той дзень на гары Аліўнай, якая перад абліччам Ерусаліму з усходу;
і рашчэпіцца гара Аліўная папалам, на ўсход і на захад, [і будзе] даліна вельмі вялікая, і
пасунецца палова гары на поўнач, а палова — на поўдзень.
5 І вы будзеце ўцякаць у даліну гор Маіх, бо даліна гор будзе сягаць аж да Ацэлу; і вы будзеце
ўцякаць, як уцякалі перад землятрусам у дні Узіі, валадара Юды; і прыйдзе ГОСПАД, Бог мой,
і ўсе сьвятыя з Ім.
6 І станецца ў той дзень, што ня будзе сьвятла каштоўнага, але цемра і холад.
7 І станецца адзіны [той] дзень, вядомы ГОСПАДУ, ані дзень, ані ноч; і станецца, што ў часе
вячэрнім будзе сьвятло.
8 І станецца ў той дзень, што пацякуць воды жывыя з Ерусаліму, палова іх — у мора ўсходняе,
і палова іх — у мора заходняе; улетку і ўзімку будзе [гэта].
9 І будзе ГОСПАД Валадаром над усёю зямлёй. У той дзень будзе ГОСПАД адзін, і імя Ягонае —
адно.
10 І ўся зямля будзе як раўніна ад Гевы да Рымону, які на поўдні ад Ерусаліму, і ён будзе
ўзьняты, і будзе заселены на месцы сваім, ад Брамы Бэн'яміна і да месца Брамы Першай, аж
да Брамы Нарожнай, і ад Вежы Хананэля аж да тоўчні валадара.

11 І будуць жыць у ім, і ўжо ня будзе там [вынішчэньня] з закляцьцем, але будзе жыць Ерусалім
у бясьпецы.
12 І гэта будзе пляга, якой ГОСПАД ударыць усе народы, якія будуць ваяваць супраць
Ерусаліму: цела іхняе згніе, хоць яны будуць стаяць на нагах сваіх, і вочы іхнія згніюць у
вачніцах іхніх, і язык іхні згніе ў роце іхнім.
13 І станецца ў той дзень, што вялікае замяшаньне ад ГОСПАДА будзе сярод іх і схопіць кожны
адзін аднаго за руку, і падымецца рука ягоная на руку бліжняга свайго.
14 І Юда таксама будзе ваяваць у Ерусаліме, і будзе сабранае багацьце ўсіх народаў навокал:
золата, срэбра і адзеньне ў мностве вялікім.
15 І такая самая пляга як пляга гэтая будзе на каня, мула, вярблюда і асла, і на ўсякую жывёлу,
якая будзе ў табарах гэтых.
16 І станецца, што кожны пазасталы з усіх народаў, якія прыходзілі супраць Ерусаліму, будуць
узыходзіць год у год, каб пакланіцца Валадару, ГОСПАДУ Магуцьцяў, і сьвяткаваць Сьвята
Намётаў.
17 І станецца, калі хто ня ўзыйдзе разам з сем'ямі зямлі ў Ерусалім, каб пакланіцца Валадару,
ГОСПАДУ Магуцьцяў, на таго ня будзе ісьці дождж.
18 І калі сем'і Эгіпту ня ўзыйдуць і ня прыйдуць, будзе на іх пляга, якой ударыць ГОСПАД
народы, якія не ўзыйшлі, каб сьвяткаваць Сьвята Намётаў.
19 Гэта будзе за грэх Эгіпту і за грэх усіх народаў, якія не ўзыйшлі, каб сьвяткаваць Сьвята
Намётаў.
20 У той дзень будзе на бомах конскіх [напісана]: "Сьвятое для ГОСПАДА", і будуць казаны ў
Доме ГОСПАДА, як тыя крапільніцы перад ахвярнікамі.
21 І будуць усе казаны ў Ерусаліме і ў Юдзе сьвятымі для ГОСПАДА Магуцьцяў. І прыйдуць усе,
хто складае ахвяру, і возьмуць, і будуць варыць у іх, і ня будзе ўжо Хананейца ў Доме ГОСПАДА
Магуцьцяў у той дзень.

КНІГА ПРАРОКА МАЛАХІІ

1 Цяжар слова ГОСПАДА да Ізраіля праз рукі Малахіі.
2 Я палюбіў вас, кажа ГОСПАД, а вы кажаце: «У чым Ты палюбіў нас?» Ці ня брат Эзаў для
Якуба, кажа ГОСПАД, а Я палюбіў Якуба,
3 а Эзава зьненавідзеў і аддаў горы ягоныя на спусташэньне, і спадчыну ягоную — цмокам
пустыні.
4 Калі скажа Эдом: «Мы зруйнаваныя, але мы вернемся і адбудуем руіны», гэтак кажа ГОСПАД
Магуцьцяў: «Яны адбудуюць, але Я зруйную, і назавуць іх межамі нягоднасьці і народам, на
які загневаўся ГОСПАД на вякі».
5 І вочы вашыя ўбачаць [гэта], і вы скажаце: «Узьвялічыўся ГОСПАД па-над межамі Ізраіля».
6 «Сын шануе бацьку, і слуга — гаспадара свайго. Дык калі Я — Айцец, дзе пашана Мне? І калі
Я — Госпад, дзе страх перада Мною?» — кажа ГОСПАД Магуцьцяў вам, сьвятары, якія грэбуеце
імем Маім, і кажаце: «Як мы грэбуем імем Тваім?»
7 Вы прыносіце на ахвярнік Мой хлеб заплямлены і кажаце: «Чым мы заплямілі Цябе?» Тым,
што вы кажаце: «Сталом ГОСПАДА [можна] пагрэбаваць».
8 І калі вы прыносіце сьляпое, каб ахвяраваць, ці не ліхота гэта? І калі прыносіце кульгавае і
хворае, ці не ліхота гэта? Наблізься з гэтым да ваяводы твайго, ці будзе ён мець ласку да цябе,
альбо ці прыйме аблічча тваё? — кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
9 А цяпер, прашу, маліце аблічча Божае, каб Ён зьлітаваўся над вамі. З рук вашых было гэта,
дык ці Ён прыйме аблічча каго з вас? — кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
10 Няхай нехта з вас замкне дзьверы [сьвятыні], і не распальвайце ахвярнік Мой надарэмна. Я
ня маю ўпадабаньня да вас, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і не прыйму дару з рукі вашай.
11 Бо ад усходу сонца аж да заходу яго вялікае [будзе] імя Маё сярод народаў, і на кожным
месцы будуць прыносіць кадзіла для імя Майго, і дар чысты, бо вялікае [будзе] імя Маё сярод
народаў, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
12 Але вы зьневажаеце яго тым, што кажаце: «Стол ГОСПАДА заплямлены, і прыбытак з яго,
пасілак ягоны ня [варты] пашаны».
13 І вы кажаце: «Вось, якая цяжкасьць», хоць зьдзьмухнуць гэта можаце, кажа ГОСПАД
Магуцьцяў, і прыносіце крадзенае, кульгавае і хворае, вы прыносіце гэтакі дар. Ці магу Я
прыняць гэта з рукі вашай? — кажа ГОСПАД.
14 І пракляты ашуканец, які мае ў чарадзе самца і абяцае [яго], і ахвяруе Госпаду папсаванае;
бо Я — Валадар вялікі, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, і імя Маё страшнае сярод народаў.

Мал 2

1 І цяпер для вас прыказаньне гэтае, сьвятары.
2 Калі вы не паслухаеце, і калі ня прыймеце да сэрца, каб даваць славу імені Майму, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў, Я пашлю на вас праклён і пракляну дабраславенствы вашыя, і нават ужо
праклінаю, бо вы ня прыймаеце [гэтага] да сэрца.
3 Вось, Я пакараю насеньне вашае і накідаю гной на абліччы вашыя, гной сьвяточных [ахвяраў]
вашых, і вынясуць вас разам з ім.
4 І вы даведаецеся, што Я паслаў вам прыказаньне гэтае, каб быў запавет Мой з Левіем, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў.
5 Запавет Мой з ім быў жыцьцём [для яго], і Я даў яму страх, і ён баяўся Мяне, і перад абліччам
імя Майго быў напоўнены страхам.
6 Закон праўды быў на вуснах ягоных, і беззаконьне не было знойдзена ў вуснах ягоных. У
супакоі і справядлівасьці ён хадзіў са Мной і шмат каго адвярнуў ад беззаконьня.
7 Бо вусны сьвятара павінны захоўваць веданьне, і закону шукаюць з вуснаў ягоных, бо ён —
пасланец ГОСПАДА Магуцьцяў.

8 Але вы зьвярнулі са шляху, і зрабілі, што шмат [людзей] спатыкнуліся ў Законе, зьнішчылі
запавет Левія, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
9 І Я таксама зраблю вас пагрэбаванымі і прыніжанымі перад усім народам, бо няма сярод вас
тых, якія захоўваюць шляхі Мае і падымаюць аблічча на Закон.
10 Хіба не адзін Айцец у-ва ўсіх нас? Хіба не адзін Бог стварыў нас? Чаму кожны здраджвае
брату свайму, зьневажаючы запавет бацькоў нашых?
11 Здрадзіў Юда, і ўчынена агіда ў Ізраілі і ў Ерусаліме, бо Юда зьняважыў сьвятыню ГОСПАДА,
якую Ён любіць, і ўзяў за жонку дачку бога чужога.
12 Няхай ГОСПАД выгубіць кожнага з намётаў Якуба, хто робіць гэта, і таго, хто бачыць [гэта],
і хто абараняе, хоць бы ён прыносіў дар ГОСПАДУ Магуцьцяў.
13 І яшчэ другое вы робіце: абліваеце сьлязьмі ахвярнік ГОСПАДА з плачам і стогнам. Ён ужо
не зьвяртае [ўвагі] на дары і не прыймае іх зычліва з рук вашых.
14 І вы кажаце: «За што?» Бо ГОСПАД быў сьведкам паміж табою і жонкай маладосьці тваёй,
якой ты здрадзіў, а яна — сяброўка твая і жонка запавету твайго.
15 Ці ж ня [Бог] адзін зрабіў [нас], і рэшта духу [належыць] Яму. І што шукае адзіны [Бог]?
Насеньня Божага. Таму захоўвайце дух ваш, і няхай [ніхто] ня здраджвае жонцы маладосьці
сваёй.
16 Бо Я ненавіджу развод, кажа ГОСПАД, Бог Ізраіля, і таго, хто пакрывае ліхадзействам
адзеньне сваё. Таму захоўвайце дух ваш, і ня здраджвайце.
17 Вы стамілі ГОСПАДА словамі вашымі, і вы кажаце: «Чым мы стамілі?» Размовамі вашымі:
«Кожны, хто робіць ліха — добры ў вачах ГОСПАДА, і Ён мае ўпадабаньне ў іх», альбо: «Дзе Бог
суду?»

Мал 3

1 Вось, Я пасылаю анёла Майго, і ён падрыхтуе шлях перад абліччам Маім, і раптоўна прыйдзе ў
сьвятыню Сваю Госпад, Якога вы шукаеце, і анёл запавету, Якога вы жадаеце. Вось, Ён прыйдзе,
кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
2 Але хто вытрымае дзень прыйсьця Ягонага, і хто ўстаіць, калі Ён зьявіцца? Бо Ён — як агонь,
які топіць, і як мыла, якое мые.
3 І Ён сядзе, каб растапіць і ачысьціць срэбра, і Ён ачысьціць сыноў Левія, і ператопіць іх як
золата і срэбра, і яны будуць для ГОСПАДА прыносіць дары ў праведнасьці.
4 І будзе прыемны для ГОСПАДА дар Юды і Ерусаліму, як у дні старавечныя і як у гады
старадаўнія.
5 І Я прыйду да вас на суд, і буду хутка сьведчыць супраць чараўнікоў і супраць чужаложнікаў,
супраць тых, хто прысягае хлусьліва, і супраць тых, хто ўціскае ў плаце найміта, удаву і сірату,
супраць тых, хто адпіхвае прыхадня і не баіцца Мяне, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
6 Бо Я — ГОСПАД, не мяняюся; і таму вы, сыны Якуба, ня будзеце зьнішчаны.
7 Ад дзён бацькоў вашых вы адступілі ад пастановаў Маіх і не захоўвалі іх. Навярніцеся да
Мяне, і Я павярнуся да вас, кажа ГОСПАД Магуцьцяў. А вы кажаце: «У чым нам навярнуцца?»
8 Ці можа чалавек абкрадваць Бога? Вы абкрадваеце Мяне. І вы кажаце: «У чым мы абкрадваем
Цябе?» У дзесяціне і ахвяраваньнях.
9 Праклёнам вы праклятыя, бо Мяне вы абкрадваеце, увесь народ ваш.
10 Прынясіце ўсю дзесяціну ў дом скарбніцы, і будзе ежа ў Доме Маім, і выспрабуйце Мяне ў
гэтым, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, ці не адчыню Я для вас вокны нябесныя, і ці ня выльлю на вас
дабраславенства больш, чым досыць?
11 І Я ўтаймую дзеля вас тых, якія зьядаюць [ураджай], і яны ня будуць нішчыць у вас плод
зямлі, і ня будзе скідваць плады вінаградная лаза вашая ў полі, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
12 І шчасьлівымі будуць называць вас усе народы, бо вы будзеце зямлёю жаданаю, кажа
ГОСПАД Магуцьцяў.
13 Прыкрыя былі супраць Мяне словы вашыя, кажа ГОСПАД. А вы кажаце: «Што мы гаварылі
супраць Цябе?»

14 Вы казалі: «Марнае служэньне Богу, і якая карысьць, што мы захоўвалі загады Ягоныя і што
хадзілі ў жалобе перад абліччам ГОСПАДА Магуцьцяў?
15 І цяпер мы шчасьлівымі называем свавольных. Уладкаваліся нават тыя, якія робяць
нягоднасьць, нават тыя, якія выпрабоўваюць Бога, уцякаюць [ад кары]».
16 Тады тыя, якія баяцца ГОСПАДА, гаварылі адзін да аднаго. І прыхіліў вуха ГОСПАД, і пачуў,
і была напісаная кніга памяці перад абліччам Ягоным пра тых, якія баяцца ГОСПАДА і якія
шануюць імя Ягонае.
17 І яны будуць Маімі, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, у дзень, калі Я зраблю іх уласнасьцю [Маёй] і
зьлітуюся над імі, як чалавек літуецца над сынам сваім, які служыць яму.
18 І вы навернецеся, і ўбачыце розьніцу паміж праведнікам і бязбожнікам, паміж тым, хто
служыць Богу, і тым, хто ня служыць Яму.

Мал 4

1 Бо вось, надыходзіць дзень, які палае, як печ, і ўсе свавольныя, і ўсе тыя, якія робяць
нягоднасьць, будуць як салома, і спаліць іх дзень, які надыходзіць, кажа ГОСПАД Магуцьцяў,
што не застанецца ад іх ані кораня, ані галінкі.
2 А для вас, якія баіцёся імя Майго, узыйдзе сонца праведнасьці, і аздараўленьне на крылах
ягоных. І вы выйдзеце, і будзеце скакаць, як цяляты з аборы.
3 І будзеце таптаць бязбожных, бо яны будуць попелам пад ступнямі ног вашых у дзень, які Я
зраблю, кажа ГОСПАД Магуцьцяў.
4 Памятайце Закон Майсея, слугі Майго, які Я загадаў яму на Харэве для ўсяго Ізраіля,
пастановы і суды.
5 Вось, Я пашлю вам Ільлю прарока перад надыходам дня ГОСПАДА, вялікага і страшнага.
6 І ён зьверне сэрца бацькоў да сыноў іхніх, і сэрца сыноў — да бацькоў іхніх, каб Я,
прыйшоўшы, ня ўдарыў зямлі [выгубленьнем] з закляцьцем.

ЭВАНГЕЛЬЛЕ ПАВОДЛЕ МАЦЬВЕЯ

1 Кніга радаводу Ісуса Хрыста, Сына Давіда, Сына Абрагама:
2 Абрагам нарадзіў Ісаака; Ісаак нарадзіў Якуба; Якуб нарадзіў Юду і братоў ягоных;
3 Юда нарадзіў Пэрэса і Зару ад Тамар; Пэрэс нарадзіў Эсрома; Эсром нарадзіў Арама;
4 Арам нарадзіў Амінадава; Амінадаў нарадзіў Наасона; Наасон нарадзіў Сальмона;
5 Сальмон нарадзіў Боаза ад Рахаў; Боаз нарадзіў Абэда ад Рут; Абэд нарадзіў Есэя;
6 Есэй нарадзіў Давіда валадара; Давід валадар нарадзіў Салямона ад [жонкі] Урыі;
7 Салямон нарадзіў Рабаама; Рабаам нарадзіў Абію; Абія нарадзіў Асу;
8 Аса нарадзіў Язафата; Язафат нарадзіў Ярама; Ярам нарадзіў Озію;
9 Озія нарадзіў Ёатама; Ёатам нарадзіў Ахаза; Ахаз нарадзіў Эзэкію;
10 Эзэкія нарадзіў Манасу; Манаса нарадзіў Амона; Амон нарадзіў Ёсію;
11 Ёсія нарадзіў Ёакіма; Ёакім нарадзіў Ехонію і братоў ягоных перад перасяленьнем у Бабілон.
12 А пасьля перасяленьня ў Бабілон Ехонія нарадзіў Салятыэля; Салятыэль нарадзіў Зэрубабэля;
13 Зэрубабэль нарадзіў Абіюда; Абіюд нарадзіў Эліякіма; Эліякім нарадзіў Азора;
14 Азор нарадзіў Садока; Садок нарадзіў Ахіма; Ахім нарадзіў Эліюда;
15 Эліюд нарадзіў Элеазара; Элеазар нарадзіў Маттана; Маттан нарадзіў Якуба;
16 Якуб нарадзіў Язэпа, мужа Марыі, ад якой нарадзіўся Ісус, называны Хрыстос.
17 Гэтак усіх пакаленьняў ад Абрагама да Давіда чатырнаццаць пакаленьняў; ад Давіда да перасяленьня ў Бабілон чатырнаццаць пакаленьняў; і ад перасяленьня ў Бабілон да Хрыста чатырнаццаць пакаленьняў.
18 Нараджэньне Ісуса Хрыста было вось як: па заручынах маці Яго Марыі з Язэпам, раней, чым яны зыйшліся, выявілася, што яна цяжарная ад Духа Сьвятога.
19 Язэп, муж ейны, будучы праведным і ня хочучы выставіць яе на сорам, хацеў цішком адпусьціць яе.
20 Але, калі ён падумаў гэтае, вось, анёл Госпада зьявіўся яму ў-ва сьне і сказаў: «Язэп, сыне Давідаў! Ня бойся прыняць Марыю, жонку тваю, бо Тое, што нарадзілася ў ёй, ёсьць ад Духа Сьвятога.
21 Вось, яна народзіць Сына, і дасі Яму імя Ісус, бо Ён збавіць народ Свой ад грахоў іхніх».
22 А ўсё гэтае сталася, каб споўнілася сказанае Госпадам праз прарока, які кажа:
23 «Вось, Дзева прыйме ва ўлоньне і народзіць Сына; і дадуць Яму імя Іммануэль, гэта значыць: З намі Бог».
24 Устаўшы зо-сну, Язэп зрабіў, як загадаў яму анёл Госпада, і прыняў жонку сваю,
25 і не спазнаў яе, аж нарадзіла Сына свайго Першароднага, і ён даў Яму імя Ісус.

Мц 2

1 Калі ж Ісус нарадзіўся ў Бэтлееме Юдэйскім у дні валадара Ірада, прыйшлі ў Ерусалім мудрацы з усходу і кажуць:
2 «Дзе народжаны Валадар Юдэйскі? Бо мы бачылі зорку Ягоную на ўсходзе і прыйшлі пакланіцца Яму».
3 Пачуўшы гэтае, Ірад валадар устрывожыўся, і ўвесь Ерусалім з ім.
4 І, сабраўшы ўсіх першасьвятароў і кніжнікаў народу, пытаўся ў іх, дзе павінен нарадзіцца Хрыстос.
5 Яны ж сказалі яму: «У Бэтлееме Юдэйскім, бо гэтак напісана праз прарока:
6 “І ты, Бэтлеем, зямля Юды, нічым ня меншы за ваяводзтвы Юды, бо з цябе выйдзе Правадыр, Які будзе пасьвіць народ Мой, Ізраіль”».
7 Тады Ірад, цішком паклікаўшы мудрацоў, выведаў ад іх час зьяўленьня зоркі.
8 І, паслаўшы іх у Бэтлеем, сказаў: «Пайдзіце, добра даведайцеся пра Дзіцятка і, калі знойдзеце, паведаміце мне, каб і я, пайшоўшы, пакланіўся Яму».

9 Яны, выслухаўшы валадара, пайшлі. І вось, зорка, якую бачылі яны на ўсходзе, ішла перад
імі, пакуль, прыйшоўшы, не спынілася над [месцам], дзе было Дзіцятка.
10 Убачыўшы зорку, яны ўзрадаваліся радасьцю вельмі вялікаю.
11 І, увайшоўшы ў дом, убачылі Дзіцятка з Марыяй, маці Ягонай, і, упаўшы, пакланіліся Яму;
і, адчыніўшы скарбы свае, прынесьлі Яму падарункі: золата, ладан і сьмірну.
12 І, меўшы ў сьне слова не варочацца да Ірада, іншым шляхам адыйшлі ў краіну сваю.
13 Калі ж яны адыйшлі, вось, анёл Госпада зьяўляецца ў сьне Язэпу і кажа: «Устань, вазьмі
Дзіцятка і маці Ягоную, і бяжы ў Эгіпет, і будзь там, пакуль не скажу табе; бо Ірад мае шукаць
Дзіцятка, каб загубіць Яго».
14 Ён устаў уначы, узяў Дзіцятка і маці Ягоную, і пайшоў у Эгіпет.
15 І там быў да сьмерці Ірада, каб споўнілася сказанае Госпадам праз прарока, які кажа: «З
Эгіпту паклікаў Я сына Майго».
16 Тады Ірад, убачыўшы, што мудрацы з яго пасьмяяліся, вельмі разгневаўся і паслаў забіць
усіх дзяцей у Бэтлееме і ўсіх ваколіцах яго, ад двух гадоў і малодшых, паводле часу, які
даведаўся ад мудрацоў.
17 Тады споўнілася сказанае праз прарока Ярэмію, які кажа:
18 «Голас у Раме чутны, плач, і галашэньне, і лямант вялікі; Рахель плача па дзецях сваіх і ня
хоча суцешыцца, бо іх няма».
19 А пасьля сьмерці Ірада, вось, анёл Госпада ў сьне зьяўляецца Язэпу ў Эгіпце
20 і кажа: «Устань, вазьмі Дзіцятка і маці Ягоную і ідзі ў зямлю Ізраіля, бо памерлі тыя, што
шукалі душы Дзіцяці».
21 Ён устаў, узяў Дзіцятка і маці Ягоную, і прыйшоў у зямлю Ізраіля.
22 А пачуўшы, што ў Юдэі пануе Архелай замест Ірада, бацькі свайго, пабаяўся туды ісьці; але,
атрымаўшы слова ў сьне, пайшоў у межы Галілейскія.
23 І, прыйшоўшы, пасяліўся ў горадзе, званым Назарэт, каб споўнілася сказанае праз прарокаў,
што Ён Назарэем назавецца.

Мц 3

1 У тыя дні прыходзіць Ян Хрысьціцель, абвяшчаючы ў пустыні Юдэйскай
2 і кажучы: «Навярніцеся, бо наблізілася Валадарства Нябеснае».
3 Бо ён той, пра якога сказаў прарок Ісая: «Голас таго, хто кліча ў пустыні: Падрыхтуйце шлях
Госпаду, простымі рабіце сьцежкі Яму».
4 Сам жа Ян меў адзеньне з вярблюдавага воласу і скураны пояс на паясьніцы сваёй, а ежаю
яго была саранча і дзікі мёд.
5 Тады выходзілі да яго Ерусалім, і ўся Юдэя, і ўсе ваколіцы Ярдану,
6 і хрысьціліся ў яго ў Ярдане, вызнаючы грахі свае.
7 А ўбачыўшы мноства фарысэяў і садукеяў, якія ішлі да яго хрысьціцца, сказаў ім:
«Спараджэньні яхідны, хто навучыў вас уцякаць ад будучага гневу?
8 Учыніце ж плод, годны навяртаньня,
9 і ня думайце гаварыць у думках сваіх: “Бацьку маем Абрагама”; бо кажу вам, што Бог можа
з камянёў гэтых падняць дзяцей Абрагаму.
10 Ужо і сякера ля кораня дрэваў ляжыць; дык кожнае дрэва, якое не дае добрага плоду,
сьсякаюць і кідаюць у агонь.
11 Я хрышчу вас у вадзе на навяртаньне, але Той, Хто ідзе за мною, дужэйшы за мяне, і я ня
варты несьці сандалы Ягоныя. Ён будзе хрысьціць вас у Духу Сьвятым і ў агні.
12 Веялка Ягоная ў руцэ Ягонай, і Ён ачысьціць гумно Сваё, і зьбярэ пшаніцу Сваю ў сьвіран, а
салому спаліць агнём нязгасным».
13 Тады прыходзіць Ісус з Галілеі на Ярдан да Яна, каб хрысьціцца ў яго.
14 Ян жа ўстрымліваў Яго, кажучы: «Мне трэба хрысьціцца ў Цябе, а Ты прыходзіш да мяне?»
15 А Ісус, адказваючы, сказаў яму: «Пакінь цяпер; бо гэтак нам належыць споўніць усякую
праведнасьць». Тады дапускае Яго.

16 І, ахрысьціўшыся, Ісус адразу ж выйшаў з вады, і вось, расчынілася Яму неба, і ўгледзеў Духа
Божага, Які зыходзіў, як голуб, і прыходзіў на Яго.
17 І вось, голас з неба, які казаў: «Гэта ёсьць Сын Мой улюбёны, у Якім маю ўпадабаньне».

Мц 4

1 Тады Ісус заведзены быў Духам у пустыню дзеля спакушэньня праз д'ябла,
2 і, прапасьціўшы сорак дзён і сорак начэй, нарэшце згаладнеў.
3 І, падыйшоўшы да Яго, спакусьнік сказаў: «Калі Ты — Сын Божы, скажы, каб камяні гэтыя
сталіся хлябамі».
4 Ён жа, адказваючы, сказаў яму: «Напісана: "Ня хлебам адным будзе жыць чалавек, але ўсякім
словам, што выходзіць з вуснаў Божых"».
5 Потым бярэ Яго д'ябал у сьвяты горад, і стаўляе на самым версе сьвятыні,
6 і кажа Яму: «Калі Ты — Сын Божы, кіньcя ўніз, бо напісана: "Анёлам Сваім загадае пра Цябе,
і на руках панясуць Цябе, каб не спатыкнуўся аб камень нагою Тваёю"».
7 Ісус сказаў яму: «Ізноў жа напісана: "Не спакушай Госпада, Бога твайго"».
8 Ізноў бярэ Яго д'ябал на вельмі высокую гару, і паказвае Яму ўсе валадарствы сьвету і славу
іх,
9 і кажа Яму: «Усё гэта дам Табе, калі, упаўшы, паклонішся мне».
10 Тады Ісус кажа яму: «Адыйдзі ад Мяне, шатан! Бо напісана: "Госпаду, Богу твайму,
пакланяйся і Яму аднаму служы"».
11 Тады пакідае Яго д'ябал; і вось, анёлы прыступіліся і служылі Яму.
12 А пачуўшы, што Ян у вязьніцы, Ісус адыйшоў у Галілею.
13 І, пакінуўшы Назарэт, прыйшоў і асеў у Капэрнауме прыморскім, у межах Завулёна і
Нэфталі,
14 каб споўнілася сказанае праз прарока Ісаю, які кажа:
15 «Зямля Завулёна і зямля Нэфталі, на дарозе прыморскай за Ярданам, Галілея паганская,
16 народ, які сядзеў у цемры, убачыў сьвятло вялікае, і тым, што сядзелі ў краіне і ценю
сьмерці, сьвятло зазьзяла».
17 З таго часу Ісус пачаў абвяшчаць і казаць: «Навярніцеся, бо наблізілася Валадарства
Нябеснае».
18 Праходзячы ж недалёка ад мора Галілейскага, Ён убачыў двух братоў, Сымона, называнага
Пятром, і Андрэя, брата ягонага, якія закідалі сеткі ў мора, бо яны былі рыбаловы,
19 і кажа ім: «Ідзіце за Мною, і Я зраблю вас лаўцамі чалавекаў».
20 І яны адразу, пакінуўшы сеці, пайшлі за Ім.
21 Ідучы адтуль далей, убачыў Ён іншых двух братоў, Якуба Заўдыявага і Яна, брата ягонага, у
чаўне з Заўдыем, бацькам іхнім, якія правілі сеці свае, і паклікаў іх.
22 І яны адразу, пакінуўшы човен і бацьку свайго, пайшлі за Ім.
23 І хадзіў Ісус па ўсёй Галілеі, навучаючы ў сынагогах іхніх і абвяшчаючы Эвангельле
Валадарства, і аздараўляючы ўсякую хваробу і ўсякую немач у народзе.
24 І прайшлі пра Яго чуткі па ўсёй Сірыі, і прыводзілі да Яго ўсіх нядужых, з рознымі
хворасьцямі і пакутамі, і апанаваных дэманамі, і люнатыкаў, і спараліжаваных, і Ён іх
аздараўляў.
25 І ішлі за Ім шматлікія натоўпы з Галілеі, і Дэкапалю, і Ерусаліму, і Юдэі, і з таго боку Ярдану.

Мц 5

1 Убачыўшы натоўпы, Ён узыйшоў на гару, і, калі сеў, падыйшлі да Яго вучні Ягоныя.
2 І Ён, расчыніўшы вусны Свае, навучаў іх, кажучы:
3 «Шчасьлівыя ўбогія духам, бо іх ёсьць Валадарства Нябеснае.
4 Шчасьлівыя тыя, што плачуць, бо яны будуць суцешаныя.
5 Шчасьлівыя ціхія, бо яны возьмуць у спадчыну зямлю.
6 Шчасьлівыя тыя, што прагнуць і смагнуць праведнасьці, бо яны будуць насычаныя.

7 Шчасьлівыя міласьцівыя, бо яны будуць памілаваныя.
8 Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць.
9 Шчасьлівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі будуць названыя.
10 Шчасьлівыя тыя, каго перасьледуюць за праведнасьць, бо іх ёсьць Валадарства Нябеснае.
11 Шчасьлівыя вы, калі дзеля Мяне будуць зьневажаць вас, і перасьледаваць, і казаць усякае злое слова хлусьліва.
12 Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая нагарода вашая ў небе; бо так перасьледавалі прарокаў, якія былі раней за вас.
13 Вы — соль зямлі. Калі ж соль згубіць сілу, то чым зробіш яе салёнаю? Яна ўжо ні на што не надаецца, хіба толькі выкінуць яе вон на патаптаньне людзям.
14 Вы — сьвятло сьвету. Ня можа схавацца горад, які стаіць на вяршыні гары.
15 Ніхто не запальвае сьвечку, каб паставіць яе пад пасудзінай, але на сьвечніку, і яна сьвеціць усім, хто ёсьць у доме.
16 Гэтак няхай сьвятло вашае сьвеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя справы і славілі Айца вашага, Які ў небе.
17 Ня думайце, што Я прыйшоў парушыць Закон ці Прарокаў; не парушыць прыйшоў Я, але споўніць.
18 Бо сапраўды кажу вам: пакуль не праміне неба і зямля, аніводная ёта ці рыска не праміне з Закону, пакуль ня станецца ўсё.
19 Вось жа, хто парушыць адно з гэтых найменшых прыказаньняў і навучыць гэтаму людзей, той найменшым названы будзе ў Валадарстве Нябесным; а хто выканае і навучыць, той вялікім названы будзе ў Валадарстве Нябесным.
20 Бо кажу вам: калі праведнасьць вашая не перавысіць [праведнасьці] кніжнікаў і фарысэяў, вы ня ўвойдзеце ў Валадарства Нябеснае.
21 Вы чулі, што сказана старадаўнім: “Не забівай, а хто заб’е, падлягае суду”.
22 А Я кажу вам, што ўсякі, хто гневаецца на брата свайго дарэмна, падлягае суду; а хто скажа брату свайму: “Нікчэмны”, падлягае сынэдрыёну, а хто скажа: “Дурань”, падлягае гееньне вогненай.
23 Дык калі ты прынясеш дар твой на ахвярнік, і там узгадаеш, што брат твой мае нешта супраць цябе,
24 пакінь дар твой перад ахвярнікам і пайдзі перш пагадзіся з братам тваім, а тады, прыйшоўшы, прынясі дар твой.
25 Пагадзіся з супраціўнікам тваім хутчэй, пакуль ты яшчэ ў дарозе з ім, каб супраціўнік не аддаў цябе судзьдзі, а судзьдзя не аддаў бы цябе паслугачу, і ня быў ты кінуты ў вязьніцу.
26 Сапраўды кажу табе: ты ня выйдзеш адтуль, пакуль не аддасі апошняга кадранта.
27 Вы чулі, што сказана старадаўнім: “Не чужалож”.
28 А Я кажу вам, што ўсякі, хто глядзіць на жанчыну, жадаючы яе, ужо чужаложыць з ёю ў сэрцы сваім.
29 Калі ж правае вока тваё згаршае цябе, вырві яго і кінь ад сябе, бо лепш табе, каб загінуў адзін з членаў тваіх, а ня ўсё цела тваё было ўкінута ў геенну.
30 І калі правая рука твая згаршае цябе, адсячы яе і кінь ад сябе, бо лепш табе, каб загінуў адзін з членаў тваіх, а ня ўсё цела тваё было ўкінута ў геенну.
31 Сказана таксама, што, калі хто разлучаецца з жонкаю сваёю, няхай дасьць ёй развод.
32 А Я кажу вам: хто разлучаецца з жонкаю сваёю не з прычыны распусты, той робіць яе чужаложніцай, і хто жэніцца з разьведзенай, той чужаложыць.
33 Яшчэ чулі вы, што сказана старадаўнім: “Не прысягай фальшыва, але спаўняй перад Госпадам прысягі твае”.
34 А Я кажу вам: не прысягай зусім, ані небам, бо яно — пасад Божы;
35 ані зямлёю, бо яна — падножжа ног Ягоных, ані Ерусалімам, бо ён — горад вялікага Валадара;
36 ані галавою сваёю не прысягай, бо ня можаш аніводнага воласу зрабіць белым ці чорным.
37 Але няхай будзе слова вашае: “Так, так”, “Не, не”, а што больш таго, тое ад злога.

38 Вы чулі, што сказана: “Вока за вока і зуб за зуб”.
39 А Я кажу вам: не праціўцеся злому, але, хто ўдарыць цябе ў правую шчаку тваю, павярні да
яго і другую,
40 і хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе вопратку, аддай яму і шаты;
41 і хто прымусіць цябе ісьці з ім адну мілю, ідзі з ім дзьве.
42 Таму, хто просіць у цябе, дай, і ад таго, хто хоча ў цябе пазычыць, не адварочвайся.
43 Вы чулі, што сказана: “Любі бліжняга твайго і ненавідзь ворага твайго”.
44 А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце тых, якія праклінаюць вас, рабіце
дабро тым, якія ненавідзяць вас, і маліцеся за тых, якія крыўдзяць вас і перасьледуюць вас,
45 каб сталіся вы сынамі Айца вашага, Які ў небе, бо Ён узьнімае сонца Сваё над добрымі і злымі
і спасылае дождж на праведных і няправедных.
46 Бо калі вы любіце тых, якія вас любяць, якая вам нагарода? Ці ж ня так робяць і мытнікі?
47 І калі вы вітаеце толькі братоў вашых, што асаблівае робіце? Ці ж не такім чынам робяць і
мытнікі?
48 Дык будзьце ж дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш, Які ў небе.

Мц 6

1 Сьцеражыцеся, не рабіце міласьціны вашае перад людзьмі з тым, каб яны бачылі вас, бо тады
ня будзеце мець нагароды ад Айца вашага, Які ў небе.
2 Калі ж даеш міласьціну, не трубі перад сабою, як робяць крывадушнікі ў сынагогах і на
вуліцах, каб людзі славілі іх. Сапраўды кажу вам: яны ўжо атрымліваюць нагароду сваю.
3 У цябе ж, калі ты робіш міласьціну, няхай левая рука твая ня ведае, што робіць правая,
4 каб міласьціна твая была ўтоена, і Айцец твой, Які бачыць утоенае, дасьць табе яўна.
5 І калі молішся, ня будзь, як крывадушнікі, бо яны любяць у сынагогах і на вуглах вуліцаў,
спыніўшыся, маліцца, каб паказацца перад людзьмі. Сапраўды кажу вам, што яны ўжо
атрымліваюць нагароду сваю.
6 Ты ж, калі молішся, увайдзі ў пакой твой і, зачыніўшы дзьверы твае, памаліся Айцу твайму,
Які ўтоены, і Айцец твой, Які бачыць утоенае, дасьць табе яўна.
7 А молячыся, не гаварыце лішняга, як пагане, бо яны думаюць, што ў шматслоўі сваім будуць
пачутыя.
8 Ня будзьце падобныя да іх, бо ведае Айцец ваш, у чым вы маеце патрэбу, раней, чым вы
папросіце ў Яго.
9 Маліцеся ж вось гэтак: “Ойча наш, Які ёсьць у небе! Сьвяціся імя Тваё;
10 прыйдзі Валадарства Тваё; будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі.
11 Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня.
12 І адпусьці нам правіны нашыя, як і мы адпускаем вінаватым нашым;
13 і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Бо Тваё Валадарства, і моц, і слава навекі.
Амэн”.
14 Бо, калі вы будзеце адпускаць людзям грахі іхнія, то і вам адпусьціць Айцец ваш, Які ў небе.
15 А калі ня будзеце адпускаць людзям грахоў іхніх, то і Айцец ваш не адпусьціць грахоў вашых.
16 А калі посьціце, ня будзьце панурымі, быццам крывадушнікі; бо яны зьмяняюць абліччы
свае, каб, посьцячыся, паказацца перад людзьмі. Сапраўды кажу вам, што яны ўжо
атрымліваюць нагароду сваю.
17 А ты, посьцячыся, памаж галаву тваю і абмый аблічча тваё,
18 каб ня перад людзьмі паказацца посьцячым, але перад Айцом тваім, Які ўтоены, і Айцец
твой, Які бачыць утоенае, дасьць табе яўна.
19 Не зьбірайце сабе скарбаў на зямлі, дзе моль і іржа нішчаць, і дзе злодзеі падкопваюць і
крадуць;
20 але зьбірайце сабе скарбы ў небе, дзе ані моль, ані іржа ня нішчаць, і дзе злодзеі не
падкопваюць і не крадуць.
21 Бо дзе скарб ваш, там будзе і сэрца вашае.

22 Сьветач цела ёсьць вока. Калі вока тваё чыстае, усё цела тваё будзе сьветлае.
23 Калі ж вока тваё злое, усё цела тваё будзе цёмным. Калі ж сьвятло, якое ў табе, ёсьць цемра,
дык якая ж цемра сама?
24 Ніхто ня можа служыць двум панам; бо ці аднаго будзе ненавідзець, а другога любіць, ці
аднаго будзе трымацца, а другім пагарджаць. Ня можаце Богу служыць і мамоне.
25 Таму кажу вам: не клапаціцеся пра душу вашую, што вам есьці і што піць, ані пра цела вашае,
у што апрануцца. Ці ж душа ня большая за ежу, і цела — за адзеньне?
26 Паглядзіце на птушак нябесных, што ані сеюць, ані жнуць і не зьбіраюць у сьвірны, і Айцец
ваш Нябесны жывіць іх. Наколькі ж вы лепшыя за іх.
27 Хто з вас сваім клопатам можа дадаць сабе росту хоць на адзін локаць?
28 І наконт адзеньня чаго клапоціцеся? Паглядзіце на палявыя лілеі, як яны растуць, не
працуюць, не прадуць.
29 А Я кажу вам, што нават Салямон у-ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як адна з іх.
30 Калі ж траву на полі, якая сёньня ёсьць, а заўтра будзе кінутая ў печ, Бог так апранае, дык
ці ня шмат больш вас, малаверы?
31 Дык не клапаціцеся, кажучы: “Што нам есьці?”, ці: “Што нам піць?”, ці: “У што апрануцца?”
32 Бо ўсяго гэтага шукаюць пагане. Бо Айцец ваш Нябесны ведае, што вам усё гэтае патрэбна.
33 Шукайце ж перш Валадарства Божага і праведнасьці Яго, і тое ўсё дадасца вам.
34 Дык не клапаціцеся пра заўтрашні дзень, бо заўтрашні дзень сам будзе клапаціцца пра сябе.
Досыць [кожнаму] дню свайго ліха.

Мц 7

1 Не судзіце, каб не былі суджаныя.
2 Бо якім судом судзіце, такім будзеце суджаны, і якою меркаю мераеце, гэткаю і вам
адмераюць.
3 Што ты глядзіш на сучок у воку брата твайго, а бервяна ў сваім воку ня бачыш?
4 Ці як скажаш брату твайму: “Дазволь, выму сучок з вока твайго”, а вось, у воку тваім —
бервяно?
5 Крывадушнік! Вымі перш бервяно з вока твайго, і тады ўбачыш, як выняць сучок з вока брата
твайго.
6 Не давайце сьвятога сабакам і ня кідайце пэрлаў вашых перад сьвіньнямі, каб яны не
патапталі іх нагамі сваімі і, павярнуўшыся, не парвалі вас.
7 Прасіце, і будзе вам дадзена; шукайце, і знойдзеце; стукайцеся, і адчыняць вам.
8 Бо кожны, хто просіць, атрымлівае, і хто шукае, знаходзіць, і хто стукаецца, таму адчыняць.
9 Ці ёсьць між вамі чалавек, які, калі сын ягоны папросіць хлеба, дасьць яму камень?
10 І калі папросіць рыбы, дасьць яму зьмяю?
11 Дык калі вы, будучы злымі, умееце добрыя дары даваць дзецям вашым, тым больш Айцец
ваш, Які ў небе, дасьць добрае тым, што просяць у Яго.
12 Дык усё, што хочаце, каб вам рабілі людзі, тое і вы ім рабіце; бо ў гэтым Закон і Прарокі.
13 Уваходзьце праз цесную браму, бо шырокая брама і прасторны шлях, што вядуць да загубы,
і шмат хто ўваходзіць праз іх,
14 бо цесная брама і вузкі шлях, што вядуць у жыцьцё, і мала хто знаходзіць іх.
15 Сьцеражыцеся фальшывых прарокаў, якія прыходзяць да вас у авечым адзеньні, а ўнутры
яны — ваўкі драпежныя.
16 Паводле пладоў іхніх пазнаеце іх. Ці зьбіраюць з церняў вінаград або з асоту фігі?
17 Гэтак усякае добрае дрэва дае плады добрыя, а благое дрэва дае плады дрэнныя.
18 Ня можа дрэва добрае даваць плады дрэнныя, ані благое дрэва даваць плады добрыя.
19 Усякае дрэва, якое не дае добрага плоду, сьсякаюць і кідаюць у агонь.
20 Таму паводле пладоў іхніх пазнаеце іх.
21 Ня кожны, хто кажа Мне: “Госпадзе! Госпадзе!”, увойдзе ў Валадарства Нябеснае, але той,
хто выконвае волю Айца Майго, Які ў небе.

22 Многія скажуць Мне ў той дзень: “Госпадзе, Госпадзе! Ці не ў Тваё імя мы прарочылі? І ці
не ў Тваё імя выганялі дэманаў? І ці не ў Тваё імя шмат цудаў чынілі?”
23 І тады прызнаюся ім: “Я ніколі ня ведаў вас. Адыйдзіцеся ад Мяне, вы, што чыніце
беззаконьне”.
24 Дык кожнага, хто слухае гэтыя словы Мае і выконвае іх, прыраўняю да чалавека мудрага,
які пабудаваў дом свой на скале.
25 І пайшоў дождж, і разьліліся рэкі, і падзьмулі вятры, і ўдарылі на дом той; і ён ня ўпаў, бо
быў умацаваны на скале.
26 А кожны, хто слухае гэтыя словы Мае і не выконвае іх, будзе падобны да чалавека дурнога,
які пабудаваў дом свой на пяску.
27 І пайшоў дождж, і разьліліся рэкі, і падзьмулі вятры, і ўдарылі на дом той, і ён упаў, і было
падзеньне ягонае вялікае».
28 І сталася, калі Ісус скончыў гэтыя словы, натоўпы дзівіліся з вучэньня Ягонага,
29 бо Ён вучыў іх, як той, хто мае ўладу, і не як кніжнікі.

Мц 8

1 Калі ж Ён зыйшоў з гары, пайшлі за Ім шматлікія натоўпы.
2 І вось пракажоны, падыйшоўшы, пакланіўся Яму, кажучы: «Госпадзе! Калі хочаш, можаш
мяне ачысьціць».
3 І, працягнуўшы руку, Ісус дакрануўся да яго, кажучы: «Хачу, будзь ачышчаны». І ён адразу
ачысьціўся ад праказы сваёй.
4 І кажа яму Ісус: «Глядзі, нікому не кажы, але пайдзі, пакажыся сьвятару і прынясі дар, які
загадаў Майсей дзеля сьведчаньня ім».
5 Калі ж увайшоў Ісус у Капэрнаум, падыйшоў да Яго сотнік, просячы Яго
6 і кажучы: «Госпадзе! Слуга мой ляжыць дома спараліжаваны і страшэнна мучыцца».
7 І кажа яму Ісус: «Я, прыйшоўшы, аздараўлю яго».
8 І, адказваючы, сотнік прамовіў: «Госпадзе! Я ня варты, каб Ты ўвайшоў пад дах мой, але
скажы толькі слова, і будзе аздароўлены слуга мой.
9 Бо і я чалавек, які пад уладаю, ды маю пад сабою жаўнераў, і кажу аднаму: “Ідзі”, і ён ідзе; і
другому: “Прыйдзі”, і ён прыходзіць; і слузе майму: “Зрабі тое”, і ён робіць».
10 Пачуўшы гэтае, Ісус зьдзівіўся і сказаў тым, якія за Ім ішлі: «Сапраўды кажу вам, нідзе ў
Ізраілі Я не знайшоў гэткае веры.
11 Кажу ж вам, што многія прыйдуць з усходу і захаду і ўзьлягуць з Абрагамам, і Ісаакам, і
Якубам у Валадарстве Нябесным,
12 а сыны Валадарства будуць выгнаныя ў цемру вонкавую; там будзе плач і скрыгат зубоў».
13 І сказаў Ісус сотніку: «Ідзі, і, як ты паверыў, станецца табе». І паздаравеў слуга ягоны ў тую
ж гадзіну.
14 І, прыйшоўшы ў дом Пятра, Ісус убачыў цешчу ягоную, якая ляжала ў гарачцы.
15 І Ён дакрануўся да рукі ейнай, і пакінула яе гарачка, і яна ўстала, і паслугавала ім.
16 Калі ж надыйшоў вечар, прывялі да Яго шмат апанаваных дэманамі, і Ён выгнаў духаў
словам, і ўсіх хворых аздаравіў,
17 каб споўнілася сказанае праз прарока Ісаю, які кажа: «Ён узяў нашыя нядужасьці і панёс
хваробы».
18 Убачыўшы ж навокал Сябе шматлікія натоўпы, Ісус загадаў адыйсьці на другі бок.
19 І, падыйшоўшы, адзін кніжнік сказаў Яму: «Настаўнік, я пайду за Табою, куды б Ты ні
пайшоў».
20 І кажа яму Ісус: «Лісы маюць норы, і птушкі нябесныя — гнёзды, а Сын Чалавечы ня мае, дзе
галаву схіліць».
21 А іншы з вучняў Ягоных сказаў Яму: «Госпадзе! Дазволь мне перш пайсьці і пахаваць бацьку
майго».
22 Ісус жа сказаў яму: «Ідзі за Мною і пакінь мёртвым хаваць сваіх мёртвых».

23 І калі ўвайшоў Ён у човен, пайшлі за Ім вучні Ягоныя.
24 І вось, сталася вялікае ўзрушэньне на моры, так што хвалі залівалі човен, а Ён спаў.
25 І, падыйшоўшы, вучні Ягоныя пабудзілі Яго, кажучы: «Госпадзе! Збаў нас, мы гінем!»
26 І кажа ім: «Чаго вы палохаецеся, малаверы?» Тады, устаўшы, забараніў вятрам і мору, і сталася вялікая ціша.
27 А людзі зьдзіўляліся, кажучы: «Хто ж Ён, што і вятры, і мора слухаюцца Яго?»
28 І, калі Ён прыйшоў на другі бераг у край Гергесэнскі, перанялі Яго двое апанаваных дэманам, якія выйшлі з магілаў, страшэнна злыя, так што ніхто ня мог праходзіць тою дарогаю.
29 І вось яны закрычалі, кажучы: «Што нам і Табе, Ісусе, Сыне Божы? Ці Ты прыйшоў сюды перад часам мучыць нас?»
30 Далёка ж ад іх пасьвіўся вялікі гурт сьвіньняў.
31 А дэманы прасілі Яго, кажучы: «Калі нас выганяеш, дазволь нам адыйсьці ў гэты гурт сьвіньняў».
32 І Ён сказаў ім: «Ідзіце». І тыя, выйшаўшы, адыйшлі ў гурт сьвіньняў. І, вось, рынуўся ўвесь гурт сьвіньняў са стромы ў мора, і загінуў у вадзе.
33 А тыя, што пасьвілі, уцяклі і, прыйшоўшы ў горад, паведамілі пра ўсё і пра тых, што былі апанаваныя дэманам.
34 І вось, увесь горад выйшаў насустрач Ісусу і, убачыўшы Яго, прасілі, каб зыйшоў ад межаў іхніх.

Мц 9

1 І, увайшоўшы ў човен, Ён пераплыў назад, і прыйшоў у Свой горад.
2 І вось, прынесьлі да Яго спараліжаванага, які ляжаў на ложку. І, бачачы веру іх, Ісус сказаў спараліжаванаму: «Будзь пэўным, дзіця! Адпускаюцца табе грахі твае».
3 І вось, некаторыя з кніжнікаў сказалі самі ў сабе: «Ён блюзьніць».
4 І, бачачы думкі іхнія, Ісус сказаў: «Чаму злое вы падумалі ў сэрцах вашых?
5 Бо што лягчэй сказаць: “Адпускаюцца табе грахі”, ці сказаць: “Устань і хадзі”?
6 Але, каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі», — кажа тады спараліжаванаму: «Устань, вазьмі ложак твой і ідзі ў дом твой».
7 І, устаўшы, ён пайшоў у дом свой.
8 Бачачы гэтае, натоўпы зьдзівіліся і славілі Бога, Які даў такую ўладу людзям.
9 І, праходзячы адтуль, Ісус убачыў чалавека, які сядзеў на мытні, званага Мацьвеем, і кажа яму: «Ідзі за Мною». І ён, устаўшы, пайшоў за Ім.
10 І сталася, як Ён узьлягаў у доме, вось, шмат мытнікаў і грэшнікаў, прыйшоўшы, узьляглі з Ісусам і вучнямі Ягонымі.
11 І фарысэі, якія бачылі гэта, сказалі вучням Ягоным: «Дзеля чаго Настаўнік ваш есьць з мытнікамі і грэшнікамі?»
12 А Ісус, пачуўшы, сказаў ім: «Не здаровыя маюць патрэбу ў лекары, але хворыя.
13 Пайдзіце ж, навучыцеся, што значыць: “Міласэрнасьці хачу, а не ахвяры”. Бо Я прыйшоў не праведнікаў, але грэшнікаў клікаць да навяртаньня».
14 Тады прыходзяць да Яго вучні Янавы, кажучы: «Чаму мы і фарысэі шмат посьцім, а Твае вучні ня посьцяць?»
15 І сказаў ім Ісус: «Ня могуць плакаць сыны вясельля, пакуль з імі жаніх. Але прыйдуць дні, калі забяруць ад іх жаніха, і тады будуць посьціць.
16 Ніхто ж не прышывае латкі з новай тканіны да старога адзеньня, бо прышытае аддзярэцца ад адзеньня, і дзіра станецца большая.
17 Не ўліваюць новага віна ў старыя мяхі, бо рвуцца мяхі, і віно выцякае, і мяхі гінуць; але новае віно ўліваюць у новыя мяхі, тады захоўваецца адно і другое».
18 Калі Ён гаварыў ім гэта, вось, падыйшоўшы, начальнік пакланіўся Яму, кажучы: «Дачка мая цяпер памірае, але прыйдзі, ускладзі на яе руку Тваю, і яна ажыве».

19 І, устаўшы, Ісус пайшоў за ім, і вучні Ягоныя.
20 І вось, жанчына, якая дванаццаць гадоў хварэла на крывацечу, падыйшоўшы ззаду,
дакранулася да крыса шаты Ягонай,
21 бо яна казала ў сабе: «Калі толькі дакрануся да шаты Ягонай, буду выратаваная».
22 Ісус жа, павярнуўшыся і ўбачыўшы яе, сказаў: «Будзь пэўная, дачка! Вера твая збавіла
цябе». І жанчына ў тую ж гадзіну паздаравела.
23 І, прыйшоўшы ў дом начальніка і ўбачыўшы жалейнікаў і ўзрушаны натоўп,
24 Ісус сказаў ім: «Адыйдзіцеся, бо не памерла дзяўчынка, але сьпіць». І сьмяяліся з Яго.
25 Калі ж вывелі натоўп, Ён, увайшоўшы, узяў яе за руку, і дзяўчынка ўстала.
26 І разыйшлася чутка пра гэта па ўсёй той зямлі.
27 І калі Ісус ішоў адтуль, ішлі за Ім два сьляпыя, крычучы і кажучы: «Зьлітуйся над намі, Сыне
Давідаў!»
28 Калі ж Ён прыйшоў у дом, падыйшлі да Яго сьляпыя. І кажа ім Ісус: «Ці вы верыце, што Я
магу гэтае зрабіць?» Кажуць яму: «Так, Госпадзе!»
29 Тады Ён дакрануўся да вачэй іхніх, кажучы: «Паводле веры вашае няхай станецца вам».
30 І адчыніліся вочы іхнія. І Ісус грозна глянуў на іх, кажучы: «Глядзіце, каб ніхто ня ведаў».
31 А яны, выйшаўшы, шырылі вестку пра Яго па ўсёй той зямлі.
32 Калі ж тыя выходзілі, вось прывялі да Яго чалавека нямога, апанаванага дэманам.
33 І, калі дэман быў выгнаны, нямы загаварыў, і натоўп зьдзіўляўся, кажучы: «Ніколі не
здаралася гэткае ў Ізраілі».
34 А фарысэі казалі: «Праз князя дэманаў Ён выганяе дэманаў».
35 І абыходзіў Ісус усе гарады і мястэчкі, навучаючы ў сынагогах, і абвяшчаючы Эвангельле
Валадарства, і аздараўляючы ўсякую хваробу і ўсякую немач у народзе.
36 Убачыўшы ж натоўпы, Ён зьлітаваўся над імі, што былі саслабелыя і расьцярушаныя,
быццам авечкі, якія ня маюць пастуха.
37 Тады кажа вучням Сваім: «Сапраўды, жніво багатае, а работнікаў мала.
38 Дык прасіце Гаспадара жніва, каб выслаў работнікаў на жніво Сваё».

Мц 10

1 І, паклікаўшы дванаццаць вучняў Сваіх, Ён даў ім уладу над нячыстымі духамі, каб выганяць
іх і аздараўляць усякую хваробу і ўсякую немач.
2 А дванаццаці апосталаў імёны такія: першы — Сымон, называны Пятром, і Андрэй, брат
ягоны, Якуб Заўдыяў і Ян, брат ягоны,
3 Філіп і Барталамей, Тамаш і Мацьвей мытнік, Якуб Алфеяў і Леўвей, якога звалі Тадэвушам,
4 Сымон Кананіт і Юда Іскарыёт, які і выдаў Яго.
5 Гэтых дванаццаць паслаў Ісус і загадаў ім, кажучы: «На шлях паганаў не ўзыходзьце і ў горад
Самаранскі не ўваходзьце,
6 а ідзіце больш да авечак з дому Ізраіля, якія загінулі.
7 Ідучы ж, абвяшчайце, кажучы, што наблізілася Валадарства Нябеснае.
8 Нядужых аздараўляйце, пракажоных ачышчайце, мёртвых уваскрашайце, дэманаў
выганяйце. Дарма атрымалі, дарма давайце.
9 Не бярыце з сабою ані золата, ані срэбра, ані медзі ў паясы вашыя,
10 ані торбы ў дарогу, ані дзьвюх вопратак, ані сандалаў, ані кія. Бо работнік варты ежы сваёй.
11 А ў які горад ці мястэчка ўвойдзеце, даведайцеся, хто ў ім дастойны, і там заставайцеся,
пакуль ня выйдзеце.
12 А, уваходзячы ў дом, вітайце яго.
13 І, калі дом будзе сапраўды варты [гэтага], супакой ваш прыйдзе на яго; а калі ня будзе варты,
супакой ваш да вас вернецца.
14 І калі хто ня прыйме вас і ня будзе слухаць словаў вашых, то, выходзячы з дому ці з гораду
таго, абтрасіце пыл з ног вашых.

15 Сапраўды кажу вам: лягчэй будзе зямлі Садома і Гаморы ў дзень суду, чым гораду таму.
16 Вось, Я пасылаю вас, як авечак сярод ваўкоў; дык будзьце мудрыя, як зьмеі, і шчырыя, як
галубы.
17 Сьцеражыцеся людзей, бо яны будуць выдаваць вас у сынэдрыёны і ў сынагогах сваіх будуць
бічаваць вас.
18 І павядуць вас да ваяводаў і валадароў дзеля Мяне на сьведчаньне ім і паганам.
19 Калі ж будуць выдаваць вас, не клапаціцеся пра тое, як ці што вам гаварыць, бо вам у тую
гадзіну будзе дадзена, што гаварыць.
20 Бо ня вы будзеце гаварыць, але Дух Айца вашага будзе гаварыць у вас.
21 Выдасьць брат брата на сьмерць, і бацька — сына, і паўстануць дзеці на бацькоў, і
пазабіваюць іх;
22 і будуць вас ненавідзець за імя Маё, але хто вытрывае да канца, будзе збаўлены.
23 Калі ж будуць перасьледаваць вас у адным горадзе, уцякайце ў другі, бо сапраўды кажу вам:
вы не абыйдзеце ўсіх гарадоў Ізраіля, як прыйдзе Сын Чалавечы.
24 Вучань не вышэйшы за настаўніка свайго, і слуга не вышэйшы за гаспадара свайго.
25 Досыць для вучня, каб ён стаўся як настаўнік ягоны, і для слугі, каб ён стаўся як гаспадар
ягоны. Калі гаспадара дому назвалі Бэльзэбулам, тым больш хатніх яго.
26 Дык ня бойцеся іх, бо няма нічога прыкрытага, каб не адкрылася, ані тайнага, каб ня сталася
вядомым.
27 Што кажу вам у цемры, кажыце пры сьвятле; і што чуеце на вуха, абвяшчайце з даха ў.
28 І ня бойцеся тых, што забіваюць цела, а душы забіць ня могуць; а бойцеся больш Таго, Хто
можа і душу, і цела загубіць у гееньне.
29 Ці ж ня два вераб'і продаюцца за асар? І ніводзін з іх не ўпадзе на зямлю бяз волі Айца
вашага.
30 А ў вас і валасы на галаве ўсе палічаны.
31 Дык ня бойцеся, вы лепшыя за многіх вераб'ёў.
32 Дык кожнага, хто Мяне прызнае перад людзьмі, таго і Я прызнаю перад Айцом Маім, Які ў
небе.
33 А хто адрачэцца Мяне перад людзьмі, таго і Я адракуся перад Айцом Маім, Які ў небе.
34 Ня думайце, што Я прыйшоў прынесьці супакой на зямлю; не супакой прыйшоў Я
прынесьці, але меч.
35 Бо Я прыйшоў разлучыць чалавека з бацькам яго, і дачку — з маці яе, і нявестку — са
сьвякрухай яе.
36 І ворагі чалавеку хатнія яго.
37 Хто любіць бацьку ці маці больш за Мяне, ня варты Мяне; і хто любіць сына ці дачку больш
за Мяне, ня варты Мяне.
38 І хто не бярэ крыжа свайго і ідзе за Мною, той ня варты Мяне.
39 Хто знойдзе душу сваю, загубіць яе; а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне, знойдзе яе.
40 Хто прыймае вас, прыймае Мяне, а хто прыймае Мяне, прыймае Таго, Хто паслаў Мяне.
41 Хто прыймае прарока ў імя прарока, атрымае нагароду прарока; і хто прыймае праведніка
ў імя праведніка, атрымае нагароду праведніка.
42 І калі хто напоіць аднаго з малых гэтых толькі кубкам халоднай вады ў імя вучня, сапраўды
кажу вам, ня страціць нагароды сваёй».

Мц 11

1 І сталася, калі скончыў Ісус загадваць дванаццаці вучням Сваім, пайшоў адтуль вучыць і
абвяшчаць у гарады іхнія.
2 Ян жа, пачуўшы ў вязьніцы пра дзеяньні Хрыста, паслаў двух вучняў сваіх
3 сказаць Яму: «Ці Ты — Той, Які прыходзіць, ці чакаць нам іншага?»
4 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Ідзіце, паведаміце Яну, што чуеце і бачыце:

5 сьляпыя бачаць і кульгавыя ходзяць, пракажоныя ачышчаюцца і глухія чуюць, мёртвыя
ўваскрасаюць і ўбогім дабравесьціцца.
6 І шчасьлівы той, хто ня згоршыцца праз Мяне».
7 Калі ж тыя пайшлі, Ісус пачаў гаварыць да натоўпаў пра Яна: «Што глядзець хадзілі вы ў
пустыню? Ці трысьціну, якую вецер хістае?
8 Але што хадзілі вы ўбачыць? Ці чалавека, апранутага ў мяккія шаты? Вось, тыя, што носяць
мяккія шаты, знаходзяцца ў дамах валадарскіх.
9 Але што хадзілі вы ўбачыць? Прарока? Так, кажу вам, і больш за прарока.
10 Бо ён ёсьць той, пра якога напісана: “Вось, Я пасылаю анёла Майго перад абліччам Тваім,
які пракладзе шлях Твой перад Табою”.
11 Сапраўды кажу вам: Сярод народжаных жанчынамі не паўставаў большы за Яна
Хрысьціцеля, але найменшы ў Валадарстве Нябесным большы за яго.
12 Ад дзён Яна Хрысьціцеля дагэтуль Валадарства Нябеснае сілаю здабываецца, і тыя, хто
ўжывае сілу, захопліваюць яго.
13 Бо ўсе Прарокі і Закон прарочылі да Яна.
14 І калі маеце прыняць, ён ёсьць Ільля, якому належыць прыйсьці.
15 Хто мае вушы слухаць, няхай слухае.
16 З кім параўнаю пакаленьне гэтае? Яно падобнае да дзяцей, якія сядзяць на вуліцы і клічуць
да таварышаў сваіх,
17 і кажуць: “Мы гралі вам на жалейцы, і вы не скакалі; мы галасілі, і вы ня плакалі”.
18 Бо прыйшоў Ян, ня есьць, ня п’е, і кажуць: “Дэмана мае”.
19 Прыйшоў Сын Чалавечы, есьць і п’е; і кажуць: “Вось, чалавек — абжора і п’яніца, сябра
мытнікаў і грэшнікаў”. І апраўдана мудрасьць дзецьмі яе».
20 Тады пачаў Ён дакараць гарады, у якіх найбольш сталася цудаў Ягоных, за тое, што яны не
навярнуліся:
21 «Гора табе, Харазін! Гора табе, Бэтсаіда! Бо калі б у Тыры і Сідоне сталіся цуды, якія былі
стаўшыся ў вас, даўно б яны ў зрэбніцы і ў попеле навярнуліся.
22 Аднак кажу вам: Тыру і Сідону лягчэй будзе ў дзень суду, чым вам.
23 І ты, Капэрнаум, які да неба ўзьнёсся, у пекла скінуты будзеш. Бо калі б у Садоме сталіся
цуды, якія былі стаўшыся ў табе, ён застаўся б да гэтага дня.
24 Аднак кажу вам, што зямлі Садомскай лягчэй будзе ў дзень суду, чым табе».
25 У той час, адказваючы, Ісус сказаў: «Вызнаю Цябе, Ойча, Госпадзе неба і зямлі, што Ты схаваў
гэтае ад мудрых і разумных, і адкрыў немаўлятам.
26 Так, Айцец, бо гэтак было даспадобы Табе.
27 Усё Мне аддадзена Айцом Маім, і ніхто не спазнаў Сына, акрамя Айца; і ніхто не спазнаў
Айца, акрамя Сына і каму Сын пастанавіў адкрыць.
28 Прыйдзіце да Мяне ўсе спрацаваныя і абцяжараныя, і Я дам вам супачынак.
29 Вазьміце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я — ціхі і пакорнага сэрца, і знойдзеце
супачынак душам вашым.
30 Бо ярмо Маё добрае, і цяжар Мой лёгкі».

Мц 12

1 У той час праходзіў Ісус у суботу праз палеткі. Вучні ж Ягоныя былі галодныя і пачалі зрываць
каласы і есьці.
2 А фарысэі, убачыўшы гэтае, сказалі Яму: «Вось, вучні Твае робяць, што ня сьлед рабіць у
суботу».
3 Ён жа сказаў ім: «Ці ж вы не чыталі, што зрабіў Давід, калі быў галодны сам і тыя, што з ім?
4 Як ён увайшоў у дом Божы і еў хлябы пакладныя, якіх не належала есьці ані яму, ані тым,
што з ім былі, а толькі адным сьвятарам?
5 Альбо ці не чыталі вы ў Законе, што ў суботы сьвятары ў сьвятыні парушаюць суботу, і
бязьвінныя?

6 Кажу ж вам, што тут ёсьць большы за сьвятыню.
7 Калі б вы разумелі, што значыць: “Міласэрнасьці хачу, а не ахвяры”, не асудзілі б бязьвінных.
8 Бо Сын Чалавечы ёсьць Гаспадар і суботы».
9 І, адыйшоўшы адтуль, Ён увайшоў у сынагогу іхнюю.
10 І вось, быў чалавек, які меў сухую руку. І спыталіся ў Яго, каб абвінаваціць Яго, кажучы: «Ці належыцца аздараўляць у суботу?»
11 Ён жа сказаў ім: «Ці ёсьць сярод вас чалавек, які мае адну авечку, і калі яна ў суботу ўпадзе ў яму, ці ня возьме ён яе і ня выцягне?
12 Дык на колькі чалавек лепшы за авечку? Так што можна ў суботу рабіць дабро».
13 Тады кажа таму чалавеку: «Выцягні руку тваю!» І той выцягнуў, і зрабілася яна здаровая, як другая.
14 А фарысэі, выйшаўшы, учынілі нараду супраць Яго, каб Яго загубіць.
15 Але Ісус, даведаўшыся, пайшоў адтуль; і пайшлі за Ім вялікія натоўпы, і Ён аздаравіў іх усіх.
16 І забараніў ім, каб не выяўлялі Яго,
17 каб споўнілася сказанае праз прарока Ісаю, які кажа:
18 «Вось, Юнак Мой, Якога Я выбраў, Улюбёны Мой, у Якім мае ўпадабаньне душа Мая. Ускладу Дух Мой на Яго, і Ён абвесьціць народам суд.
19 Ня будзе сварыцца, ані крычаць, і ніхто не пачуе на вуліцах голасу Яго.
20 Трысьціны надламанай не пераломіць і лёну, што дыміцца, не загасіць, пакуль ня дасьць суду перамогі.
21 І на імя Ягонае будуць спадзявацца народы».
22 Тады прывялі да Яго апанаванага дэманам сьляпога і нямога, і Ён аздаравіў яго, так што сьляпы і нямы стаў і гаварыць, і бачыць.
23 І дзівіліся ўсе натоўпы, і казалі: «Ці ня гэта Сын Давідаў?»
24 А фарысэі, пачуўшы, казалі: «Ён выганяе дэманаў не іначай, як праз Бэльзэбула, князя дэманаў».
25 А Ісус, ведаючы думкі іхнія, сказаў ім: «Усякае валадарства, якое разьдзялілася само ў сабе, апусьцее; і ўсякі горад ці дом, які разьдзяліўся сам у сабе, ня будзе стаяць.
26 І калі шатан шатана выганяе, ён разьдзяліўся сам у сабе. Як можа ўстаяць валадарства ягонае?
27 І, калі Я праз Бэльзэбула выганяю дэманаў, дык сыны вашыя праз каго выганяюць? Дзеля гэтага яны будуць вам судзьдзямі.
28 А калі Я Духам Божым выганяю дэманаў, значыцца, дасягнула вас Валадарства Божае.
29 Або як можа хто ўвайсьці ў дом асілка і абрабаваць рэчы ягоныя, калі раней ня зьвяжа асілка, і тады абрабуе дом ягоны.
30 Хто не са Мною, той супраць Мяне; і хто не зьбірае са Мною, той раскідвае.
31 Дзеля гэтага кажу вам: усякі грэх і блюзьнерства будзе адпушчана людзям, а блюзьнерства на Духа ня будзе адпушчана людзям.
32 І калі хто скажа слова супраць Сына Чалавечага, будзе адпушчана яму; а калі хто скажа супраць Духа Сьвятога, ня будзе адпушчана яму ані ў гэтым веку, ані ў будучым.
33 Або ўчыніце дрэва добрым і плод ягоны добрым, або ўчыніце дрэва благім і плод ягоны благім, бо дрэва пазнаецца паводле пладоў.
34 Спараджэньне яхідны! Як вы можаце гаварыць добрае, калі вы злыя? Бо з перапоўненага сэрца гавораць вусны.
35 Добры чалавек з добрага скарбу сэрца выносіць добрае, а злы чалавек са злога скарбу выносіць злое.
36 Кажу ж вам, што ўсякае пустое слова, якое скажуць людзі, аддасцца ім у дзень суду.
37 Бо паводле словаў сваіх будзеш апраўданы і паводле словаў сваіх будзеш асуджаны».
38 Тады адказалі некаторыя з кніжнікаў і фарысэяў, кажучы: «Настаўнік! Хочам бачыць ад Цябе знак».

39 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Пакаленьне злое і чужаложнае шукае знакаў, і знакі ня
будуць дадзены яму, апрача знаку Ёны прарока.
40 Бо як Ёна быў у чэраве кіта тры дні і тры ночы, так і Сын Чалавечы будзе ў сэрцы зямлі тры
дні і тры ночы.
41 Ніні́ўцы ўстануць на суд з пакаленьнем гэтым і асудзяць яго, бо яны навярнуліся праз
пропаведзь Ёны; і вось, тут большы за Ёну.
42 Валадарка з Поўдня паўстане на суд з пакаленьнем гэтым і асудзіць яго, бо яна прыходзіла
з краю зямлі паслухаць мудрасьці Салямона; і вось, тут большы за Салямона.
43 Калі нячысты дух выйдзе з чалавека, праходзіць праз бязводныя месцы, шукаючы
супачынку, і не знаходзіць.
44 Тады кажа: “Вярнуся ў дом мой, адкуль я выйшаў”. І, прыйшоўшы, знаходзіць яго
незанятым, вымеценым і прыбраным.
45 Тады ідзе і бярэ з сабою сем іншых духаў, зьлейшых за сябе, і, увайшоўшы, жывуць там; і
для чалавека таго апошняе стаецца горш за першае. Так будзе і з гэтым пакаленьнем злым».
46 Калі ж Ён яшчэ гаварыў да натоўпаў, вось, маці і браты Ягоныя сталі вонкі, шукаючы
гаварыць з Ім.
47 А нехта сказаў Яму: «Вось маці Твая і браты Твае стаяць вонкі, шукаючы гаварыць з Табою».
48 Ён жа, адказваючы, сказаў таму, які гаварыў з Ім: «Хто маці Мая, і хто браты Мае?»
49 І, выцягнуўшы руку Сваю на вучняў Сваіх, сказаў: «Вось маці Мая і браты Мае.
50 Бо хто выконвае волю Айца Майго, Які ў небе, той Мне брат, і сястра, і маці».

Мц 13

1 У той самы дзень, выйшаўшы з дому, Ісус сеў каля мора.
2 І сабраліся да Яго шматлікія натоўпы, так што Ён увайшоў у човен і сеў, а ўвесь натоўп стаяў
на беразе.
3 І гаварыў ім шмат у прыповесьцях, кажучы: «Вось, выйшаў сейбіт сеяць.
4 І калі сеяў, адны [зярняты] ўпалі пры дарозе, і наляцелі птушкі, і падзяўблі іх.
5 Іншыя ж упалі на камяністае месца, дзе не было шмат зямлі; і адразу ўзыйшлі, бо зямля была
неглыбокая,
6 а калі ўзыйшло сонца, зьвялі і, як ня мелі кораня, высахлі.
7 Іншыя ж упалі ў церні, і вырасьлі церні, і заглушылі іх.
8 А іншыя ўпалі ў добрую зямлю і далі плод: адно — сто, адно — шэсьцьдзясят, а адно —
трыццаць.
9 Хто мае вушы, каб слухаць, няхай слухае».
10 І, падыйшоўшы, вучні сказалі Яму: «Дзеля чаго гаворыш ім у прыповесьцях?»
11 А Ён, адказваючы, сказаў ім: «Бо вам дадзена ведаць таямніцы Валадарства Нябеснага, а ім
ня дадзена.
12 Бо хто мае, таму дадзена будзе і памножыцца, а хто ня мае, у таго адымецца і тое, што мае.
13 Дзеля таго гавару ім у прыповесьцях, што яны, гледзячы, ня бачаць і, слухаючы, ня чуюць,
і не разумеюць.
14 І спаўняецца над імі прароцтва Ісаі, якое кажа: “Слыхам пачуеце, і не зразумееце, і,
гледзячы, глядзець будзеце, і ня ўбачыце.
15 Бо атлусьцела сэрца народу гэтага, і вушамі з цяжкасьцю чуюць, і вочы свае заплюшчылі, каб
ня ўбачылі вачыма, і не пачулі вушамі, і не зразумелі сэрцам, і не навярнуліся, каб Я аздаравіў
іх”.
16 Вашыя ж шчасьлівыя вочы, што бачаць, і вушы вашыя, што чуюць.
17 Бо сапраўды кажу вам, што многія прарокі і праведнікі жадалі ўбачыць, што вы бачыце, і ня
бачылі, і пачуць, што вы чуеце, і ня чулі.
18 А вы паслухайце прыповесьць пра сейбіта.
19 Да ўсякага, хто чуе слова пра Валадарства і не разумее, прыходзіць злы і крадзе пасеянае ў
сэрцы ягоным; гэта тое, што пасеянае пры дарозе.

20 А пасеянае на камяністым месцы — гэта той, хто чуе слова і адразу з радасьцю прыймае яго,
21 але ня мае ў сабе кораня і нетрывалы: калі надыходзіць прыгнёт ці перасьлед дзеля слова,
адразу горшыцца.
22 А пасеянае ў цярніне — гэта той, хто чуе слова, але клопаты веку гэтага і падман багацьця
заглушаюць слова, і яно стаецца бясплодным.
23 А пасеянае ў добрую зямлю — гэта той, хто чуе слова і разумее, той, які дае плод, і дае адзін
сто, а іншы — шэсьцьдзясят, а іншы — трыццаць».
24 Іншую прыповесьць даў Ён ім, кажучы: «Падобнае Валадарства Нябеснае да чалавека, які
пасеяў добрае насеньне на полі сваім.
25 Калі ж людзі спалі, прыйшоў вораг ягоны, і пасеяў між пшаніцаю кукаль, і пайшоў.
26 Калі ж узыйшла рунь і дала плод, тады паказаўся і кукаль.
27 І прыйшоўшы, слугі гаспадара дому сказалі яму: “Пане, ці ж ня добрае насеньне пасеяў ты
на полі тваім? Адкуль тады кукаль?”
28 Ён жа сказаў ім: “Вораг чалавек зрабіў гэтае”. А слугі сказалі яму: “Дык хочаш, мы пойдзем
і зьбярэм яго?”
29 А ён прамовіў: “Не, каб, зьбіраючы кукаль, вы не павырывалі разам з ім і пшаніцы.
30 Пакіньце расьці разам тое і другое да жніва; і ў час жніва я скажу жняцам: 'Зьбярыце
спачатку кукаль і зьвяжыце яго ў снапы, каб спаліць іх, а пшаніцу зьбярыце ў сьвіран мой'”».
31 Іншую прыповесьць даў Ён ім, кажучы: «Падобнае Валадарства Нябеснае да зярняці
гарчычнага, якое чалавек, узяўшы, пасеяў на полі сваім.
32 Яно меншае за ўсякае насеньне, а калі вырасьце — большае за ўсе расьліны і становіцца
дрэвам, так што прылятаюць птушкі нябесныя і хаваюцца ў галінах яго».
33 Іншую прыповесьць сказаў Ён ім: «Падобнае Валадарства Нябеснае да кісьлі, якую жанчына,
узяўшы, умяшала ў тры меры мукі, пакуль ня ўкісла ўсё».
34 Усё гэтае Ісус гаварыў да натоўпаў у прыповесьцях і без прыповесьці не гаварыў ім,
35 каб споўнілася сказанае праз прарока, які кажа: «Адчыню ў прыповесьцях вусны Мае;
выкажу схаванае ад стварэньня сьвету».
36 Тады Ісус, пакінуўшы натоўпы, увайшоў у дом, і падыйшлі да Яго вучні Ягоныя, кажучы:
«Растлумач нам прыповесьць пра кукаль на полі».
37 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Сейбіт добрага насеньня — гэта Сын Чалавечы.
38 Поле — гэта сьвет, добрае насеньне — гэта сыны Валадарства, а кукаль — сыны злога;
39 вораг, які пасеяў іх, — гэта д’ябал, жніво — сканчэньне веку, а жняцы — анёлы.
40 Бо як зьбіраюць кукаль і агнём паляць, так будзе пры сканчэньні веку гэтага:
41 пашле Сын Чалавечы анёлаў Сваіх, і зьбяруць з Валадарства Ягонага ўсе згаршэньні і ўсіх,
хто чыніць беззаконьне,
42 і ўкінуць іх у печ вогненную, там будзе плач і скрыгат зубоў.
43 Тады праведнікі зазьзяюць, як сонца, у Валадарстве Айца іхняга. Хто мае вушы, каб слухаць,
няхай слухае.
44 Яшчэ падобнае Валадарства Нябеснае да скарбу, схаванага ў полі, які, знайшоўшы, чалавек
схаваў, і ў радасьці сваёй ідзе, і прадае ўсё, што мае, і купляе тое поле.
45 Яшчэ падобнае Валадарства Нябеснае да чалавека купца, які шукае добрых пэрлінаў,
46 які, знайшоўшы адну каштоўную пэрліну, пайшоў, прадаў усё, што меў, і купіў яе.
47 Яшчэ падобнае Валадарства Нябеснае да нерату, які закінуты ў мора і сабраў усякага роду
рыбы.
48 Калі ён напоўніўся, выцягнуўшы яго на бераг і сеўшы, добрую сабралі ў пасудзіны, а благую
выкінулі вонкі.
49 Так будзе пры сканчэньні веку: выйдуць анёлы, і аддзеляць злых спасярод праведных,
50 і ўкінуць іх у печ вогненную, там будзе плач і скрыгат зубоў».
51 Кажа ім Ісус: «Ці зразумелі вы ўсё гэтае?» Яны кажуць Яму: «Так, Госпадзе!»
52 Ён жа сказаў ім: «Дзеля гэтага ўсякі кніжнік, навучаны пра Валадарства Нябеснае, падобны
да гаспадара дому, які выносіць са скарбу свайго новае і старое».

53 І сталася, калі скончыў Ісус прыповесьці гэтыя, Ён выйшаў адтуль.
54 І, прыйшоўшы ў бацькаўшчыну Сваю, навучаў іх у сынагозе іхняй, так што яны дзівіліся і гаварылі: «Адкуль у Яго гэткая мудрасьць і моц?
55 Ці ж Ён ня сын цесьляра? Ці не Ягоная маці завецца Марыя, і браты Ягоныя — Якуб, і Ёсія, і Сымон, і Юда?
56 І сёстры Ягоныя ці ж ня ўсе сярод нас? Адкуль жа ў Яго ўсё гэтае?»
57 І горшыліся праз Яго. А Ісус сказаў ім: «Няма прарока без пашаны, хіба толькі ў бацькаўшчыне сваёй і ў доме сваім».
58 І не ўчыніў там шмат цудаў дзеля недаверства іхняга.

Мц 14

1 У той час пачуў Ірад тэтрарх чутку пра Ісуса
2 і сказаў слугам сваім: «Гэта Ян Хрысьціцель; ён уваскрошаны з мёртвых, і дзеля гэтага цуды дзеюцца праз яго».
3 Бо Ірад, схапіўшы Яна, увязьніў яго і пасадзіў у вязьніцу за Ірадыяду, жонку Філіпа, брата свайго,
4 бо Ян казаў яму: «Не належыцца табе мець яе».
5 І, хочучы забіць яго, баяўся натоўпу, бо яго мелі за прарока.
6 А калі Ірад спраўляў народзіны, дачка Ірадыяды таньчыла пасярод іх і спадабалася Іраду.
7 Таму ён з прысягаю паабяцаў ёй даць, чаго б ні папрасіла.
8 Яна ж, падвучаная маці сваёй, сказала: «Дай мне тут на місе галаву Яна Хрысьціцеля».
9 І засумаваў валадар, але дзеля прысягі і тых, што ўзьлягалі з ім, загадаў даць.
10 І паслаў адсячы галаву Яну ў вязьніцы.
11 І прынесьлі галаву яго на місе, і далі дзяўчыне, і яна занесла маці сваёй.
12 І вучні ягоныя, прыйшоўшы, узялі цела і пахавалі яго; і, пайшоўшы, паведамілі Ісусу.
13 І, пачуўшы, Ісус адыйшоў адтуль на чаўне ў пустыннае месца адзін, і натоўп, пачуўшы тое, пайшоў за Ім з гарадоў пехатою.
14 І, выйшаўшы, Ісус убачыў шматлікія натоўпы, і зьлітаваўся над імі, і аздаравіў нямоглых іхніх.
15 А калі настаў вечар, падыйшлі да Яго вучні Ягоныя, кажучы: «Тут месца пустыннае, і гадзіна ўжо позьняя; адпусьці натоўпы, каб, пайшоўшы ў мястэчкі, купілі сабе ежы».
16 А Ісус сказаў ім: «Ня трэба ім ісьці. Вы дайце ім есьці».
17 Яны ж кажуць Яму: «Нічога тут ня маем, толькі пяць хлябоў і дзьве рыбы».
18 А Ён сказаў: «Прынясіце Мне іх сюды».
19 І, загадаўшы натоўпам узьлегчы на траве, узяў пяць хлябоў і дзьве рыбы, і, зірнуўшы ў неба, дабраславіў і, паламаўшы, даў вучням хлеб, а вучні — натоўпу.
20 І елі ўсе, і насыціліся; і сабралі кавалкаў, што засталіся, дванаццаць поўных кашоў.
21 А тых, што елі, было каля пяці тысячаў мужчынаў, акрамя жанчынаў і дзяцей.
22 І адразу змусіў Ісус вучняў Сваіх увайсьці ў човен і плысьці перш за Яго на другі бок, пакуль Ён адпусьціць натоўпы.
23 І, адпусьціўшы натоўпы, Ён узыйшоў на гару памаліцца насамоце; і, як надыйшоў вечар, быў там адзін.
24 А човен ужо быў пасярод мора, кіданы хвалямі, бо вецер быў супраціўны.
25 А ў чацьвёртую варту ночы пайшоў да іх Ісус, ідучы па моры.
26 І вучні, убачыўшы Яго, як ішоў па моры, стрывожыліся, кажучы: «Гэта здань», і ад страху закрычалі.
27 Ісус жа адразу загаварыў з імі, кажучы: «Будзьце пэўныя, гэта Я; ня бойцеся».
28 Адказваючы ж Яму, Пётар сказаў: «Госпадзе! Калі гэта Ты, загадай мне ісьці да Цябе па вадзе».
29 Ён жа сказаў: «Ідзі». І, выйшаўшы з чаўна, Пётар пайшоў па вадзе, ідучы да Ісуса.

30 Але, бачачы моцны вецер, спалохаўся і, пачаўшы тануць, закрычаў, кажучы: «Госпадзе,
ратуй мяне!»
31 А Ісус адразу, працягнуўшы руку, схапіў яго і кажа яму: «Малаверны! Чаму ты
засумняваўся?»
32 І калі ўвайшлі яны ў човен, вецер сьціх.
33 А тыя, што былі ў чаўне, падыйшоўшы, пакланіліся Яму, кажучы: «Сапраўды, Ты — Сын
Божы!»
34 І, пераплыўшы, прыйшлі ў зямлю Генэсарэцкую.
35 І людзі тамтэйшыя, пазнаўшы Яго, паслалі ў-ва ўсю ваколіцу тую, і прынесьлі да Яго ўсіх
хворых.
36 І прасілі Яго, каб толькі дакрануцца да краю адзеньня Ягонага; і ўсе, якія дакрануліся, былі
аздароўленыя.

Мц 15

1 Тады прыходзяць да Ісуса з Ерусаліму кніжнікі і фарысэі, кажучы:
2 «Чаму вучні Твае адступаюцца ад традыцыяў старэйшых? Бо ня мыюць рукі свае, калі ядуць
хлеб».
3 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Чаму і вы адступаецеся ад прыказаньня Божага дзеля
традыцыяў вашых?
4 Бо Бог загадаў, кажучы: “Шануй бацьку твайго і маці”, і: “Хто праклінае бацьку ці маці, няхай
сьмерцю памрэ”.
5 А вы кажаце: “Калі хто скажа бацьку або маці: 'Дар [Богу] тое, чым ты ад мяне карыстаўся',
6 той можа і не шанаваць бацьку свайго ці маці сваю”. І вы пазбавілі сілы прыказаньне Божае
дзеля традыцыяў вашых.
7 Крывадушнікі! Слушна прарочыў пра вас Ісая, кажучы:
8 “Народ гэты набліжаецца да Мяне вуснамі сваімі і губамі шануе Мяне; а сэрца іхняе
трымаецца далёка ад Мяне.
9 Але марна пакланяюцца Мне, навучаючы вучэньняў і пастановаў чалавечых”».
10 І, паклікаўшы натоўп, сказаў ім: «Слухайце і разумейце:
11 Ня тое, што ўваходзіць у вусны, апаганьвае чалавека, але тое, што выходзіць з вуснаў,
апаганьвае чалавека».
12 Тады вучні Ягоныя, падыйшоўшы, казалі Яму: «Ці ведаеш, што фарысэі, пачуўшы слова
гэтае, згоршыліся?»
13 Ён жа, адказваючы, сказаў: «Усякая расьліна, якую не пасадзіў Айцец Мой Нябесны, будзе
выкарчавана.
14 Пакіньце іх; яны — сьляпыя павадыры сьляпых; а калі сьляпы вядзе сьляпога, абодва
ўваляцца ў яму».
15 Пётар жа, адказваючы, сказаў Яму: «Растлумач нам прыповесьць гэтую».
16 А Ісус сказаў: «Няўжо і вы такія няцямкія?
17 Ці ж яшчэ не разумееце, што ўсё, што ўваходзіць у вусны, трапляе ў жывот і выкідаецца
прэч?
18 А тое, што выходзіць з вуснаў, — з сэрца выходзіць; гэта апаганьвае чалавека.
19 Бо з сэрца выходзяць злыя думкі, забойствы, распуснасьць, чужалоства, крадзяжы,
фальшывыя сьведчаньні, блюзьнерствы.
20 Гэта апаганьвае чалавека, а есьці нямытымі рукамі не апаганьвае чалавека».
21 І, выйшаўшы адтуль, Ісус адыйшоў у межы Тыру і Сідону.
22 І вось жанчына Хананейская, выйшаўшы з тых ваколіцаў, крычала Яму, кажучы: «Зьлітуйся
нада мною, Госпадзе, Сыне Давідаў! Дачка мая цяжка апанаваная дэманам!»
23 А Ён не адказаў ёй ані слова. І вучні Ягоныя, падыйшоўшы, прасілі Яго, кажучы: «Адпусьці
яе, бо яна крычыць за намі».
24 Ён жа, адказваючы, сказаў: «Я пасланы толькі да авечак з дому Ізраіля, якія загінулі».
25 А яна, прыйшоўшы, пакланілася Яму, кажучы: «Госпадзе! Дапамажы мне».

26 Ён жа, адказваючы, сказаў: «Ня добра ўзяць хлеб у дзяцей і кінуць сабакам».
27 А яна сказала: «Так, Госпадзе! Але і сабакі ядуць крошкі, якія падаюць са стала гаспадароў іхніх».
28 Тады, адказваючы, Ісус сказаў ёй: «О, жанчына! Вялікая вера твая; няхай станецца табе, як ты хочаш». І была аздароўленая дачка ейная з тае гадзіны.
29 І, перайшоўшы адтуль, прыйшоў Ісус да мора Галілейскага і, узыйшоўшы на гару, сеў там.
30 І падыйшлі да Яго шматлікія натоўпы, маючы з сабою кульгавых, сьляпых, нямых, калекаў і шмат іншых, і пакінулі іх каля ног Ісуса; і Ён аздаравіў іх,
31 так што натоўп зьдзіўляўся, бачачы, што нямыя гавораць, калекі здаравеюць, кульгавыя ходзяць і сьляпыя бачаць, і славіў Бога Ізраіля.
32 А Ісус, паклікаўшы вучняў Сваіх, сказаў: «Шкада Мне гэтых людзей, што ўжо тры дні са Мною і ня маюць, што есьці; і не хачу адпусьціць іх галоднымі, каб не саслабелі ў дарозе».
33 І кажуць Яму вучні Ягоныя: «Адкуль у нас у пустыні столькі хлеба, каб накарміць гэтакі натоўп?»
34 І кажа ім Ісус: «Колькі маеце хлябоў?» Яны ж сказалі: «Сем, і некалькі рыбак».
35 І Ён загадаў натоўпам узьлегчы на зямлі.
36 І, узяўшы сем хлябоў і рыбы, падзякаваўшы, паламаў і даў вучням Сваім, а вучні — натоўпу.
37 І елі ўсе, і наеліся; і сабралі кавалкаў, што засталіся, сем кашоў поўных.
38 А тых, што елі, было чатыры тысячы мужчынаў, акрамя жанчынаў і дзяцей.
39 І, адпусьціўшы натоўп, Ён увайшоў у човен і прыйшоў у ваколіцы Магдалы.

Мц 16

1 І, падыйшоўшы, фарысэі і садукеі, спакушаючы Яго, прасілі паказаць ім знак з неба.
2 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Увечары вы кажаце: “Будзе пагода, бо неба чырвонае”.
3 І раніцаю: “Сёньня непагадзь, бо неба чырвонае і пахмурнае”. Крывадушнікі! Аблічча неба адрозьніваеце, а знакаў часу ня можаце?
4 Пакаленьне злое і чужаложнае знаку шукае, і знак ня будзе дадзены яму, апрача знаку Ёны прарока». І, пакінуўшы іх, адыйшоў.
5 І, перабраўшыся на другі бок, вучні Ягоныя забыліся ўзяць хлеба.
6 А Ісус сказаў ім: «Глядзіце, сьцеражыцеся кісьлі фарысэйскай і садукейскай».
7 Яны ж разважалі між сабою, кажучы: «Бо мы хлябоў ня ўзялі».
8 Зразумеўшы ж гэта, Ісус сказаў ім: «Чаму разважаеце між сабою, малаверы, што хлябоў ня ўзялі?
9 Ці яшчэ не разумееце і ня памятаеце тыя пяць хлябоў на пяць тысячаў, і колькі кашоў назьбіралі?
10 Ці тыя сем хлябоў на чатыры тысячы, і колькі кашоў назьбіралі?
11 Як не разумееце, што не наконт хлеба сказаў Я вам сьцерагчыся кісьлі фарысэйскай і садукейскай?»
12 Тады яны зразумелі, што Ён гаварыў ім сьцерагчыся ня кісьлі хлебнае, але вучэньня фарысэйскага і садукейскага.
13 А прыйшоўшы ў межы Цэзарэі Філіпавай, Ісус спытаўся ў вучняў Сваіх, кажучы: «Кім людзі называюць Мяне, Сына Чалавечага?»
14 А яны сказалі: «Адны — Янам Хрысьціцелем, другія — Ільлём, а іншыя — Ярэміем ці адным з прарокаў».
15 Ён кажа ім: «А вы кім Мяне называеце?»
16 Сымон жа Пётар, адказваючы, сказаў: «Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога».
17 І, адказваючы, Ісус сказаў яму: «Шчасьлівы ты, Сымон, сын Ёны, бо ня цела і кроў адкрылі табе гэтае, але Айцец Мой, Які ў небе.
18 І Я кажу табе: Ты — скала, і на гэтай скале Я збудую Царкву Маю, і брамы пекла не перамогуць яе.

19 І дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што зьвяжаш на зямлі, тое будзе зьвязана ў небе;
і што разьвяжаш на зямлі, тое будзе разьвязана ў небе».
20 Тады загадаў Ён вучням Сваім, каб нікому не казалі, што Ён ёсьць Ісус Хрыстос.
21 Ад таго часу пачаў Ісус паказваць вучням Сваім, што Ён мусіць пайсьці ў Ерусалім і шмат
перацярпець ад старшыняў, і першасьвятароў, і кніжнікаў, і быць забітым, і на трэці дзень
уваскрэснуць.
22 І, адклікаўшы Яго, Пётар пачаў забараняць Яму, кажучы: «Будзь міласьцівы да Сябе,
Госпадзе! Няхай ня будзе гэтага з Табою!»
23 Ён жа, павярнуўшыся, сказаў Пятру: «Адыйдзі ад Мяне, шатан! Ты Мне згаршэньне, бо
думаеш не пра тое, што Божае, але пра тое, што чалавечае».
24 Тады Ісус сказаў вучням Сваім: «Калі хто хоча ісьці за Мною, няхай адрачэцца ад сябе, і
возьме крыж свой, і ідзе за Мною.
25 Бо хто хоча душу сваю выратаваць, той загубіць яе, а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне,
той знойдзе яе.
26 Бо якая карысьць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь сьвет, а душы сваёй пашкодзіць? Або што
дасьць чалавек у выкуп за душу сваю?
27 Бо мае прыйсьці Сын Чалавечы ў славе Айца Свайго з анёламі Сваімі; і тады аддасьць
кожнаму паводле ўчынкаў ягоных.
28 Сапраўды кажу вам: ёсьць некаторыя, што тут стаяць, якія не пакаштуюць сьмерці, пакуль
ня ўбачаць Сына Чалавечага, Які ідзе ў Валадарстве Сваім».

Мц 17

1 І праз шэсьць дзён бярэ Ісус Пятра, Якуба і Яна, брата ягонага, і вядзе іх на гару высокую
адных.
2 І Ён перамяніўся перад імі, і сьвяцілася аблічча Ягонае, як сонца, а шаты Ягоныя сталіся
белыя, як сьвятло.
3 І вось, зьявіліся ім Майсей і Ільля, ведучы гутарку з Ім.
4 Адказваючы, Пётар сказаў Ісусу: «Госпадзе! Добра нам тут быць; калі хочаш, зробім тут тры
намёты: Табе адзін, і Майсею адзін, і адзін Ільлі».
5 Калі ён яшчэ гаварыў, вось, воблака сьветлае ахінула іх; і вось, голас з воблака, які кажа:
«Гэта Сын Мой улюбёны, у Якім маю ўпадабаньне; Яго слухайце».
6 І, пачуўшы, вучні ўпалі на аблічча сваё і моцна спужаліся.
7 І Ісус, падыйшоўшы, дакрануўся да іх і сказаў: «Устаньце і ня бойцеся!»
8 Падняўшы ж вочы свае, яны нікога ня ўбачылі, акрамя аднаго Ісуса.
9 І калі яны зыходзілі з гары, Ісус загадаў ім, кажучы: «Нікому не кажыце пра гэты відзеж,
пакуль Сын Чалавечы не ўваскрэсьне з мёртвых».
10 І спыталіся ў Яго вучні Ягоныя, кажучы: «Чаму ж кніжнікі кажуць, што Ільля мусіць
прыйсьці спачатку?»
11 А Ісус, адказваючы, сказаў ім: «Ільля сапраўды прыйдзе спачатку і направіць усё.
12 А Я кажу вам, што Ільля ўжо прыйшоў, і не пазналі яго, але ўчынілі з ім, як хацелі; гэтак і
Сын Чалавечы мае перацярпець ад іх».
13 Тады вучні зразумелі, што Ён казаў ім пра Яна Хрысьціцеля.
14 І калі яны прыйшлі да натоўпу, падыйшоў да Яго чалавек, падаючы перад ім на калені і
кажучы:
15 «Госпадзе! Зьлітуйся над сынам маім, ён люнатык і цяжка церпіць; бо часта кідаецца ў агонь
і часта ў ваду.
16 І я прыводзіў яго да вучняў Тваіх, і яны не маглі аздаравіць яго».
17 Ісус жа, адказваючы, сказаў: «О, пакаленьне бязьвернае і сапсаванае! Дакуль буду з вамі?
Дакуль буду цярпець вас? Прывядзіце яго да Мяне сюды».
18 І забараніў яму Ісус, і дэман выйшаў з яго, і хлопец быў аздароўлены ў тую гадзіну.
19 Тады вучні, падыйшоўшы да Ісуса насамоце, сказалі: «Чаму мы не маглі выгнаць яго?»

20 А Ісус сказаў ім: «Дзеля недаверства вашага. Бо сапраўды кажу вам: калі вы маеце веру, як
гарчычнае зерне, і скажаце гары гэтай: “Перайдзі адгэтуль туды”, дык яна пяройдзе; і нішто
ня будзе немагчымым для вас.
21 Гэты ж род выходзіць толькі праз малітву і пост».
22 Калі ж былі яны ў Галілеі, Ён сказаў ім: «Сын Чалавечы мае быць выдадзены ў рукі людзей,
23 і заб’юць Яго, і на трэці дзень Ён уваскрэсьне». І яны дужа засмуціліся.
24 Калі ж прыйшлі яны ў Капэрнаум, падыйшлі да Пятра зьбіральнікі дыдрахмаў і сказалі:
«Настаўнік ваш ці ня дасьць дыдрахмы?»
25 Ён кажа: «Так». І калі ён увайшоў у дом, Ісус папярэдзіў яго, кажучы: «Як ты думаеш,
Сымоне, валадары зямныя з каго бяруць мыта ці даніну, ці са сваіх сыноў, ці з чужых?»
26 Пётар кажа Яму: «З чужых». Сказаў яму Ісус: «Значыцца, сыны вольныя.
27 Але, каб нам не згаршаць іх, пайшоўшы на мора, кінь вуду, і першую рыбу, якая пападзецца,
вазьмі, і, расчыніўшы ёй рот, знойдзеш статыр; узяўшы яго, аддай ім за Мяне і за сябе».

Мц 18

1 У тую гадзіну падыйшлі вучні да Ісуса, кажучы: «Дык хто большы ў Валадарстве Нябесным?»
2 І, паклікаўшы дзіцятка, Ісус паставіў яго пасярод іх
3 і сказаў: «Сапраўды кажу вам: калі не навернецеся і ня станецеся, як дзеці, ня ўвойдзеце ў
Валадарства Нябеснае.
4 Дык хто панізіць сябе, як гэтае дзіця, той большы ў Валадарстве Нябесным.
5 І хто прыйме адно гэткае дзіцятка ў імя Маё, той Мяне прыймае.
6 А хто згоршыць аднаго з малых гэтых, якія вераць у Мяне, такому лепш было б, каб павесілі
млынавы камень на шыю ягоную і ўтапілі яго ў глыбіні мора.
7 Гора сьвету ад згаршэньняў, бо патрэбна, каб прыйшлі згаршэньні; але гора таму чалавеку,
праз якога прыходзіць згаршэньне.
8 Калі ж рука твая ці нага твая горшыць цябе, адсячы іх і кінь ад сябе: лепш табе ўвайсьці ў
жыцьцё кульгавым ці калекаю, чым, маючы дзьве рукі або дзьве нагі, быць укінутым у агонь
вечны.
9 І калі вока тваё горшыць цябе, вырві яго і кінь ад сябе: лепш табе аднавокім увайсьці ў
жыцьцё, чым, маючы двое вачэй, быць укінутым у геенну вогненную.
10 Глядзіце, не пагарджайце ані адным з малых гэтых, бо кажу вам, што анёлы іхнія ў небе
заўсёды бачаць аблічча Айца Майго Нябеснага.
11 Бо Сын Чалавечы прыйшоў, каб збавіць тое, што загінула.
12 Як вы думаеце, калі б нейкі чалавек меў сто авечак, і адна з іх заблукала, ці, пакінуўшы
дзевяноста дзевяць у гарах, ня пойдзе ён шукаць тую, што заблукала?
13 І, калі станецца, што знойдзе яе, сапраўды кажу вам: ён узрадуецца з яе больш, чым з
дзевяноста дзевяці, якія не заблукалі.
14 Гэтак няма волі Айца вашага, Які ў небе, каб загінуў адзін з малых гэтых.
15 Калі ж саграшыць супраць цябе брат твой, пайдзі і дакары яго між табою і ім адным; калі
паслухаецца цябе, ты здабыў брата твайго.
16 Калі ж не паслухаецца, вазьмі з сабою яшчэ аднаго ці двух, каб вуснамі двух або трох сьведак
змацавалася ўсякае слова.
17 Калі ж не пачуе, скажы царкве, а калі і царквы не пачуе, няхай будзе ён табе, як паганін і
мытнік.
18 Сапраўды кажу вам: усё, што вы зьвяжаце на зямлі, будзе зьвязана ў небе, і што разьвяжаце
на зямлі, будзе разьвязана ў небе.
19 Ізноў кажу вам, што калі двое з вас на зямлі згодзяцца адносна любой справы, дык што ні
папросяць, станецца ім ад Айца Майго, Які ў небе.
20 Бо дзе двое або трое сабраныя дзеля імя Майго, там Я сярод іх».
21 Тады Пётар, падыйшоўшы да Яго, сказаў: «Госпадзе! Колькі разоў брат мой будзе грашыць
супраць мяне, і я дарую яму? Ці да сямі разоў?»

22 Кажа яму Ісус: «Не кажу табе: да сямі, але да сямідзесяці разоў па сем.
23 Дзеля гэтага Валадарства Нябеснае падобнае да чалавека валадара, які захацеў
разрахавацца са слугамі сваімі.
24 Калі ж пачаў ён рахавацца, прывялі да яго аднаго, які вінен быў дзесяць тысячаў талентаў.
25 А як ня меў што аддаць, пан ягоны загадаў прадаць яго, і жонку ягоную, і дзяцей, і ўсё, што
меў, і заплаціць.
26 Тады слуга той, упаўшы, пакланіўся яму, кажучы: “Пане! Будзь доўгацярплівым да мяне, і
ўсё табе аддам”.
27 Пан, зьлітаваўшыся над слугою тым, адпусьціў яго і дараваў яму пазыку.
28 А слуга той, выйшаўшы, знайшоў аднаго з таварышаў сваіх, які вінен быў яму сто дынараў,
і, схапіўшы яго, душыў, кажучы: “Аддай мне, што вінен”.
29 Тады таварыш ягоны, упаўшы да ног яго, прасіў яго, кажучы: “Будзь доўгацярплівым да
мяне, і ўсё аддам табе”.
30 А той не захацеў, але адыйшоўшы, кінуў яго ў вязьніцу, пакуль не аддасьць доўгу.
31 Таварышы ягоныя, убачыўшы, што сталася, вельмі засмуціліся і, прыйшоўшы, паведамілі
пану свайму ўсё, што сталася.
32 Тады пан ягоны, паклікаўшы яго, кажа яму: “Злы слуга! Увесь твой доўг я дараваў табе, калі
ты прасіў мяне.
33 Ці ж ня мусіў і ты зьлітавацца над таварышам тваім, як і я зьлітаўся над табою?”
34 І, загневаўшыся, пан ягоны аддаў яго катам, пакуль не аддасьць яму ўсяго доўгу.
35 Так і Айцец Мой Нябесны ўчыніць вам, калі не даруе кожны з вас ад сэрца свайго брату
свайму грахоў ягоных».

Мц 19

1 І сталася, калі скончыў Ісус словы гэтыя, выйшаў з Галілеі і прыйшоў у межы Юдэйскія на
той бок Ярдану.
2 І пайшлі за Ім шматлікія натоўпы, і Ён аздаравіў іх там.
3 І падыйшлі да Яго фарысэі, спакушаючы Яго і кажучы Яму: «Ці за ўсякую віну можна чалавеку
разводзіцца з жонкаю сваёю?»
4 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Ці вы не чыталі, што Той, Хто стварыў на пачатку, мужчынай
і жанчынай стварыў іх?
5 І Ён сказаў: “Дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку і маці, і прылепіцца да жонкі сваёй; і будуць
двое адным целам”.
6 Так што яны ўжо ня двое, але адно цела. Вось жа, што Бог злучыў, тое чалавек няхай не
разлучае».
7 Яны кажуць Яму: «Як тады Майсей даў прыказаньне даць разводны ліст і пакінуць яе?»
8 Ён кажа ім: «Майсей дзеля жорсткасьці сэрца вашага дазволіў вам разводзіцца з жонкамі
вашымі, а на пачатку не было гэтак.
9 А Я кажу вам: хто пакіне жонку сваю не за распусту і ажэніцца з іншаю, той чужаложыць; і
хто ажэніцца з разьведзенаю, чужаложыць».
10 Кажуць Яму вучні Ягоныя: «Калі гэткі абавязак чалавека да жонкі, не карысна жаніцца».
11 Ён жа сказаў ім: «Ня ўсе ўмяшчаюць слова гэтае, але каму дадзена.
12 Бо ёсьць скапцы, што з улоньня маці гэткімі нарадзіліся; і ёсьць скапцы, якія выпакладаныя
людзьмі; і ёсьць скапцы, якія самі сябе выпакладалі дзеля Валадарства Нябеснага. Хто можа
ўмясьціць, няхай умесьціць».
13 Тады прыносілі да Яго дзяцей, каб Ён усклаў на іх рукі і памаліўся; а вучні забаранялі ім.
14 А Ісус сказаў: «Пакіньце дзяцей і не забараняйце ім прыходзіць да Мяне; бо гэткіх ёсьць
Валадарства Нябеснае».
15 І, усклаўшы на іх рукі, пайшоў адтуль.
16 І вось нехта, падыйшоўшы, сказаў Яму: «Настаўнік добры! Што мне зрабіць добрага, каб
мець жыцьцё вечнае?»

17 Ён жа сказаў яму: «Чаму ты называеш Мяне добрым? Ніхто ня добры, акрамя аднаго Бога.
Калі ж хочаш увайсьці ў жыцьцё, захоўвай прыказаньні».
18 Кажа Яму: «Якія?» Ісус жа сказаў: «Не забівай; не чужалож; не крадзі; ня сьведчы
фальшыва;
19 шануй бацьку твайго і маці; і любі бліжняга твайго, як самога сябе».
20 Кажа Яму юнак: «Усё гэта я захаваў ад юнацтва майго. Чаго яшчэ мне не стае?»
21 Ісус прамовіў да яго: «Калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасьць тваю і раздай
убогім, і будзеш мець скарб у небе, і прыходзь, ідзі за Мною».
22 Пачуўшы гэтае слова, юнак адыйшоў засмучаны, бо меў вялікую маёмасьць.
23 А Ісус сказаў вучням Сваім: «Сапраўды кажу вам, што цяжка багатаму ўвайсьці ў
Валадарства Нябеснае.
24 Зноў жа кажу вам: лягчэй вярблюду прайсьці праз вушка іголкі, чым багатаму ўвайсьці ў
Валадарства Божае».
25 Пачуўшы гэтае, вучні Ягоныя надта дзівіліся, кажучы: «Хто ж тады можа быць збаўленым?»
26 А Ісус, паглядзеўшы, сказаў ім: «У людзей гэта немагчыма, а ў Бога ўсё магчыма».
27 Тады Пётар, адказваючы, сказаў Яму: «Вось, мы пакінулі ўсё і пайшлі за Табою; што ж будзе
нам?»
28 А Ісус сказаў ім: «Сапраўды кажу вам, што вы, якія пайшлі за Мною, у адроджаным [сьвеце],
калі Сын Чалавечы сядзе на пасадзе славы Сваёй, сядзеце на дванаццаці пасадах судзіць
дванаццаць каленаў Ізраіля.
29 І кожны, хто пакінуў дамы, або братоў, або сёстраў, або бацьку, або маці, або жонку, або
дзяцей, або палі дзеля імя Майго, атрымае ў стакроць больш і ўспадкаеміць жыцьцё вечнае.
30 Многія ж першыя будуць апошнімі, і апошнія — першымі.

Мц 20

1 Бо Валадарства Нябеснае падобнае да чалавека гаспадара дому, які выйшаў рана раніцаю
наняць работнікаў у вінаграднік свой.
2 І, дамовіўшыся з работнікамі па дынару за дзень, паслаў іх у вінаграднік свой.
3 І, выйшаўшы каля трэцяе гадзіны, ён убачыў іншых, якія стаялі на рынку бяз працы.
4 І сказаў ім: “Ідзіце і вы ў вінаграднік мой і, што будзе справядліва, дам вам”. Яны пайшлі.
5 Зноў выйшаўшы каля шостае і дзявятае гадзіны, зрабіў гэтаксама.
6 А выйшаўшы каля адзінаццатае гадзіны, ён знайшоў іншых, якія стаялі бяз працы, і кажа ім:
“Чаму вы стаіцё тут цэлы дзень бяз працы?”
7 Яны кажуць яму: “Ніхто нас не наняў”. Ён кажа ім: “Ідзіце і вы ў вінаграднік і, што будзе
справядліва, атрымаеце”.
8 А як надыйшоў вечар, кажа гаспадар вінаградніку наглядчыку свайму: “Пакліч работнікаў і
аддай ім плату, пачаўшы з апошніх да першых”.
9 І тыя, што прыйшлі каля адзінаццатае гадзіны, атрымалі па дынару.
10 А тыя, што прыйшлі першымі, думалі, што яны атрымаюць больш, але і яны атрымалі па
дынару.
11 І, атрымаўшы, пачалі наракаць на гаспадара дому,
12 кажучы: “Гэтыя апошнія рабілі адну гадзіну, і ты зраўняў іх з намі, якія перанесьлі цяжар
дня і сьпёку”.
13 Ён жа, адказваючы, сказаў аднаму з іх: “Дружа! Я ня крыўджу цябе. Ці ж не за дынар ты
дамовіўся са мною?
14 Вазьмі сваё і ідзі. А я хачу даць гэтаму апошняму тое, што і табе.
15 Ці ж я не магу ў сваім рабіць, што хачу? Або вока тваё злоснае, што я добры?”
16 Гэтак будуць апошнія першымі, і першыя — апошнімі, бо шмат пакліканых, але мала
выбраных».
17 І, узыходзячы ў Ерусалім, Ісус дарогаю ўзяў дванаццаць вучняў Сваіх і сказаў ім:

18 «Вось, мы ўзыходзім у Ерусалім, і Сын Чалавечы будзе выдадзены першасьвятарам і кніжнікам, і яны асудзяць Яго на сьмерць,
19 і выдадуць Яго паганам на зьдзек, і бічаваньне, і ўкрыжаваньне; і на трэці дзень Ён уваскрэсьне».
20 Тады падыйшла да Яго маці сыноў Заўдыя з сынамі сваімі, кланяючыся і нечага просячы ў Яго.
21 Ён жа сказаў ёй: «Чаго ты хочаш?» Яна кажа Яму: «Скажы, каб гэтыя два сыны мае селі адзін праваруч Цябе, а другі — леваруч у Валадарстве Тваім».
22 А Ісус, адказваючы, сказаў: «Ня ведаеце, чаго просіце. Ці можаце піць келіх, які Я маю піць, і хрысьціцца хрышчэньнем, якім Я хрышчуся?» Яны кажуць Яму: «Можам».
23 І Ён кажа ім: «Сапраўды, келіх Мой будзеце піць і хрышчэньнем, якім Я хрышчуся, будзеце хрысьціцца, а сесьці праваруч Мяне і леваруч Мяне не магу даць вам, але каму падрыхтавана Айцом Маім».
24 І пачуўшы гэта, дзесяцёра абурыліся на двух братоў.
25 А Ісус, паклікаўшы іх, сказаў: «Вы ведаеце, што князі народаў пануюць над імі і магнаты маюць уладу над імі.
26 А ў вас ня гэтак мае быць, але хто хоча між вамі стацца большым, няхай будзе служыцелем вашым,
27 і хто хоча між вамі быць першым, няхай будзе слугою вашым,
28 як і Сын Чалавечы не прыйшоў, каб Яму служылі, але каб паслужыць і аддаць душу Сваю на адкупленьне многіх».
29 І калі яны выходзілі з Ерыхону, за Ім ішоў шматлікі натоўп.
30 І вось, два сьляпыя, што сядзелі пры дарозе, пачуўшы, што Ісус праходзіць, закрычалі, кажучы: «Зьлітуйся над намі, Госпадзе, Сыне Давідаў!»
31 А натоўп сварыўся на іх, каб маўчалі; а яны яшчэ мацней закрычалі, кажучы: «Зьлітуйся над намі, Госпадзе, Сыне Давідаў!»
32 І, спыніўшыся, Ісус паклікаў іх і сказаў: «Што вы хочаце, каб Я зрабіў вам?»
33 Яны кажуць Яму: «Госпадзе! Каб адчыніліся вочы нашыя».
34 Ісус жа, зьлітаваўшыся, дакрануўся да вачэй іхніх, і адразу сталі бачыць вочы іхнія, і яны пайшлі за Ім.

Мц 21

1 І калі наблізіліся да Ерусаліму і прыйшлі да Бэтфагі на гары Аліўнай, тады Ісус паслаў двух вучняў,
2 кажучы ім: «Ідзіце ў мястэчка, якое перад вамі, і адразу знойдзеце асьліцу прывязаную і асьляня з ёю; адвязаўшы, прывядзіце да Мяне.
3 І калі хто скажа вам нешта, адкажыце, што Госпад іх патрабуе, і адразу пашле іх».
4 А ўсё гэтае сталася, каб споўнілася сказанае праз прарока, які кажа:
5 «Скажыце дачцэ Сыёну: “Вось, Валадар твой ідзе да цябе ціхі, Які сядзіць на асьліцы і асьляняці, сыне пад’ярэмнай”».
6 Пайшоўшы, вучні зрабілі так, як загадаў ім Ісус.
7 Прывялі асьліцу і асьляня і ўсклалі на іх адзеньне сваё, і Ён сеў на іх.
8 А шматлікі натоўп пасьцілаў на дарозе адзеньне сваё, а іншыя рэзалі галіны з дрэваў і пасьцілалі на дарозе.
9 А натоўпы, што наперадзе і за Ім ішлі, крычалі, кажучы: «Гасанна Сыну Давіда! Дабраслаўлёны Той, Хто ідзе ў імя Госпада! Гасанна на вышынях!»
10 І калі Ён увайшоў у Ерусалім, узварухнуўся ўвесь горад, кажучы: «Хто гэта?»
11 А натоўпы казалі: «Гэта Ісус, прарок з Назарэту Галілейскага».
12 І ўвайшоў Ісус у сьвятыню Божую, і выгнаў усіх, што продалі і куплялі ў сьвятыні, і сталы мяняльнікаў і лаўкі прадаўцоў галубоў перакуліў.
13 І кажа ім: «Напісана: “Дом Мой домам малітвы будзе названы”. А вы зрабілі яго пячорай разбойнікаў».

14 І падыйшлі да Яго ў сьвятыні сьляпыя і кульгавыя, і Ён аздаравіў іх.
15 А першасьвятары і кніжнікі, убачыўшы цуды, якія Ён учыніў, і дзяцей, якія крычалі ў
сьвятыні і казалі: «Гасанна Сыну Давіда!», — абурыліся
16 і сказалі Яму: «Ці чуеш, што яны кажуць?» А Ісус кажа ім: «Так! Ці вы ніколі не чыталі: “З
вуснаў немаўлятаў і тых, што пры грудзях, Ты ўчыніў хвалу?”»
17 І, пакінуўшы іх, выйшаў з гораду ў Бэтанію, і правёў там ноч.
18 А раніцаю, вяртаючыся ў горад, адчуў голад.
19 І, убачыўшы пры дарозе адно дрэва фігавае, падыйшоў да яго, і нічога не знайшоў на ім,
акрамя адной лістоты, і кажа да яго: «Няхай больш ня будзе з цябе плоду да веку». І адразу
засохла дрэва фігавае.
20 І, убачыўшы гэта, вучні зьдзівіліся, кажучы: «Як гэта адразу ж засохла дрэва фігавае?»
21 А Ісус, адказваючы, сказаў ім: «Сапраўды кажу вам: калі вы будзеце мець веру і ня будзеце
сумнявацца, ня толькі зробіце тое, што з дрэвам фігавым, але калі і гары гэтай скажаце: “Будзь
узятая і кінутая ў мора”, — станецца.
22 І ўсё, што будзеце прасіць у малітве з вераю, атрымаеце».
23 І калі прыйшоў Ён у сьвятыню, падыйшлі да Яго, калі Ён вучыў, першасьвятары і старшыні
народу, кажучы: «Якою ўладаю Ты гэта робіш? І хто Табе даў гэтую ўладу?»
24 А Ісус, адказваючы, сказаў ім: «Спытаюся і Я ў вас адно слова; калі на гэта скажаце Мне, і Я
вам скажу, якою ўладаю раблю гэта.
25 Хрышчэньне Яна адкуль было: з неба ці ад людзей?» Яны ж разважалі між сабою, кажучы:
«Калі скажам: “З неба”, — Ён скажа нам: “Чаму ж вы не паверылі яму?”
26 А калі скажам: “Ад людзей”, — баімся натоўпу, бо ўсе маюць Яна за прарока».
27 І, адказваючы, сказалі Ісусу: «Ня ведаем». І Ён сказаў ім: «І Я вам не скажу, якою ўладаю
гэтае раблю.
28 А як вы думаеце: чалавек меў дваіх дзяцей, і ён, падыйшоўшы да першага, сказаў: “Дзіцятка,
ідзі сёньня працаваць у вінаграднік мой”.
29 Той жа, адказваючы, сказаў: “Не хачу”, а пасьля, пакаяўшыся, пайшоў.
30 І, падыйшоўшы да другога, ён сказаў тое самае. Той, адказваючы, сказаў: “Іду, гаспадару”,
і не пайшоў.
31 Каторы з двух выканаў волю бацькі?» Кажуць Яму: «Першы». Кажа ім Ісус: «Сапраўды кажу
вам, што мытнікі і распусьніцы ідуць наперадзе вас у Валадарства Божае.
32 Бо прыйшоў да вас Ян шляхам праведнасьці, і вы не паверылі яму, а мытнікі і распусьніцы
паверылі яму; вы ж, бачачы гэтае, не пакаяліся пасьля, каб паверыць яму.
33 Паслухайце другую прыповесьць: быў нейкі чалавек, гаспадар дому, які пасадзіў
вінаграднік, і абгарадзіў яго плотам, і выкапаў у ім тоўчню, і пабудаваў вежу, і здаў яго
вінаградарам, і выехаў.
34 Калі ж наблізіўся час пладоў, ён паслаў слугаў сваіх да вінаградараў узяць плады свае.
35 І схапілі вінаградары слугаў ягоных, аднаго зьбілі, другога забілі, а іншага ўкаменавалі.
36 Зноў паслаў ён іншых слугаў, больш, чым раней; і з імі зрабілі тое самае.
37 Нарэшце паслаў да іх сына свайго, кажучы: “Пасаромеюцца сына майго”.
38 А вінаградары, убачыўшы сына, сказалі адзін аднаму: “Гэта спадкаемца! Хадзем, заб’ем яго
і атрымаем спадчыну ягоную”.
39 І, схапіўшы яго, выгналі вон з вінаградніку і забілі.
40 Калі ж прыйдзе гаспадар вінаградніку, што зробіць ён з гэтымі вінаградарамі?»
41 Кажуць Яму: «Ліхадзеяў гэтых жорстка выгубіць, а вінаграднік здасьць іншым
вінаградарам, якія будуць аддаваць яму плады ў свой час».
42 Кажа ім Ісус: «Няўжо вы ніколі не чыталі ў Пісаньні: “Камень, які адкінулі будаўнікі, стаўся
галавою вугла. Ад Госпада гэта сталася, і дзіўна ў вачах нашых”.
43 Дзеля гэтага кажу вам, што будзе забранае ў вас Валадарства Божае і дадзена будзе народу,
які ўчыняе плады ягоныя.

44 І той, хто ўпадзе на гэты камень, разаб’ецца; а на каго ён упадзе, таго раздушыць».
45 І, пачуўшы прыповесьці Ягоныя, першасьвятары і фарысэі зразумелі, што Ён гаворыць пра іх.
46 І, шукаючы ўзяць Яго, збаяліся натоўпаў, таму што яны мелі Яго за прарока.

Мц 22

1 І, адказваючы, Ісус зноў гаварыў з імі ў прыповесьцях, кажучы:
2 «Валадарства Нябеснае падобнае да чалавека валадара, які справіў вясельле для сына свайго.
3 І ён паслаў слугаў сваіх клікаць пакліканых на вясельле; і тыя не хацелі прыйсьці.
4 Зноў паслаў ён іншых слугаў, кажучы: “Скажыце пакліканым: Вось, я падрыхтаваў бяседу маю, валы мае і, што ўкормлена, зарэзаны, і ўсё падрыхтавана. Прыходзьце на вясельле”.
5 А яны, ня дбаючы пра тое, пайшлі, хто на поле сваё, а хто да гандлю свайго.
6 А іншыя, узяўшы слугаў ягоных, зьняважылі іх і забілі.
7 Пачуўшы пра гэтае, валадар загневаўся і, паслаўшы жаўнераў сваіх, выгубіў забойцаў тых, і горад іхні спаліў.
8 Тады кажа ён слугам сваім: “Сапраўды, вясельле падрыхтаванае, але пакліканыя не былі вартыя.
9 Дык пайдзіце на ростані дарог і ўсіх, каго знойдзеце, клічце на вясельле”.
10 І слугі тыя, выйшаўшы на дарогі, сабралі ўсіх, каго толькі знайшлі, злых і добрых; і на вясельлі было поўна гасьцей.
11 Увайшоўшы ж пабачыць тых, што ўзьлягалі, валадар убачыў там чалавека, не апранутага ў вясельнае адзеньне,
12 і кажа яму: “Дружа, як ты ўвайшоў сюды, ня маючы вясельнага адзеньня?” Той жа маўчаў.
13 Тады сказаў валадар слугам: “Зьвязаўшы яму рукі і ногі, вазьміце яго і ўкіньце ў цемру вонкавую; там будзе плач і скрыгат зубоў.
14 Бо шмат пакліканых, але мала выбраных”».
15 Тады, пайшоўшы, фарысэі зрабілі нараду, як злавіць Яго ў словах.
16 І пасылаюць да Яго вучняў сваіх з ірадыянамі, кажучы: «Настаўнік! Мы ведаем, што Ты праўдзівы і пра шлях Божы паводле праўды навучаеш, і не дагаджаеш нікому, бо не глядзіш на аблічча людзей.
17 Дык скажы нам, як Ты думаеш, ці належыцца даваць даніну цэзару, ці не?»
18 А Ісус, разумеючы зласьлівасьць іхнюю, сказаў: «Чаму спакушаеце Мяне, крывадушнікі?
19 Пакажыце Мне манэту для даніны». Яны ж прынесьлі Яму дынар.
20 І кажа ім: «Чый гэта вобраз і надпіс?»
21 Кажуць Яму: «Цэзара». Тады кажа ім: «Дык аддавайце тое, што цэзара, цэзару, а тое, што Божае, — Богу».
22 І, пачуўшы гэта, яны зьдзівіліся, і, пакінуўшы Яго, адыйшлі.
23 У той дзень падыйшлі да Яго садукеі, якія кажуць, што няма ўваскрасеньня, і спыталіся ў Яго:
24 «Настаўнік, Майсей сказаў: “Калі хто памрэ, ня маючы дзяцей, брат ягоны няхай возьме жонку ягоную і адновіць насеньне брату свайму”.
25 Было ж у нас сем братоў, і першы, ажаніўшыся, памёр і, ня маючы насеньня, пакінуў жонку сваю брату свайму.
26 Таксама і другі, і трэці, аж да сёмага.
27 Пасьля ўсіх памерла і жонка.
28 Дык пры ўваскрасеньні якога з сямі будзе яна жонкаю? Бо ўсе мелі яе».
29 Адказваючы, Ісус сказаў ім: «Вы памыляецеся, ня ведаючы ані Пісаньня, ані моцы Божае.
30 Бо пры ўваскрасеньні ня жэняцца і замуж не выходзяць, але будуць як анёлы Божыя ў небе.
31 А наконт уваскрасеньня мёртвых, ці не чыталі вы сказанага вам Богам, Які кажа:
32 “Я — Бог Абрагама, і Бог Ісаака, і Бог Якуба!” Бог ня ёсьць Бог мёртвых, але жывых».
33 І, пачуўшы, натоўпы дзівіліся з вучэньня Ягонага.

34 А фарысэі, пачуўшы, што Ён прымусіў змоўкнуць садукеяў, сабраліся супраць Яго.
35 І спытаўся адзін з іх, законьнік, спакушаючы Яго і кажучы:
36 «Настаўнік, якое найбольшае прыказаньне ў Законе?»
37 А Ісус сказаў яму: «“Любі Госпада, Бога твайго, усім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменьнем тваім”.
38 Гэта ёсьць першае і найбольшае прыказаньне.
39 Другое ж падобнае да яго: “Любі бліжняга свайго, як самога сябе”.
40 На гэтых двух прыказаньнях трымаецца ўвесь Закон і Прарокі».
41 А ў фарысэяў, якія сабраліся, Ісус спытаўся,
42 кажучы: «Што вы думаеце пра Хрыста? Чый Ён Сын?» Кажуць Яму: «Давіда».
43 Кажа ім: «Як жа Давід у Духу называе Яго Госпадам, кажучы:
44 “Сказаў Госпад Госпаду майму: Сядзь праваруч Мяне, пакуль пакладу ворагаў Тваіх як падножжа ног Тваіх”.
45 Дык калі Давід называе Яго Госпадам, як жа Ён — сын ягоны?»
46 І ніхто ня змог адказаць Яму ані слова; і з таго дня ніхто ўжо не адважваўся пытацца ў Яго.

Мц 23

1 Тады Ісус прамовіў да натоўпаў і вучняў Сваіх,
2 кажучы: «На Майсеевай лаве паселі кніжнікі і фарысэі.
3 Дык усё, што скажуць вам захоўваць, захоўвайце і рабіце, але не рабіце паводле ўчынкаў іхніх, бо яны кажуць і ня робяць.
4 Бо яны вяжуць цяжары цяжкія і невыносныя і ўскладаюць на плечы людзям, а самі пальцам сваім ня хочуць зрушыць іх.
5 Усе ж учынкі свае яны робяць, каб бачылі іх людзі; пашыраюць філяктэрыі свае і павялічваюць крысо шатаў сваіх,
6 і любяць першыя месцы на вячэрах і першыя месцы ў сынагогах,
7 і вітаньні на рынку, і каб людзі называлі іх: “Раббі, раббі!”
8 А вы не называйцеся “раббі”, бо адзін у вас Настаўнік — Хрыстос, а ўсе вы — браты.
9 І айцом сабе не называйце [нікога] на зямлі, бо адзін у вас Айцец, Які ў небе.
10 І не называйцеся настаўнікамі, бо адзін у вас Настаўнік — Хрыстос.
11 А большы з вас няхай будзе вам за слугу.
12 Усякі ж, хто ўзвысіць сябе, паніжаны будзе, а хто паніжае сябе, будзе ўзвышаны.
13 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што зачыняеце Валадарства Нябеснае перад людзьмі; бо самі не ўваходзіце, і тым, што ўваходзяць, не дазваляеце ўвайсьці.
14 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што аб’ядаеце дамы ўдоваў і дзеля віду доўга моліцеся; за гэта атрымаеце цяжэйшы прысуд.
15 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што абыходзіце мора і сухмень, каб зрабіць хоць аднаго празэлітам, і, калі станецца, робіце яго сынам геенны, удвая [горшым] за вас.
16 Гора вам, павадыры сьляпыя, якія кажаце: “Калі хто прысягне бажніцаю, гэта нічога, а калі хто прысягне золатам бажніцы, дык вінен”.
17 Дурныя і сьляпыя! Бо што большае: золата або бажніца, якая асьвячае золата?
18 І: “Калі хто прысягне ахвярнікам, гэта нічога, а калі хто прысягне дарам, які на ім, дык вінен”.
19 Дурныя і сьляпыя! Бо што большае: дар або ахвярнік, які асьвячае дар?
20 Дык той, хто прысягае ахвярнікам, прысягае і ім, і ўсім, што на ім;
21 і хто прысягае бажніцаю, прысягае ёю і Тым, Хто жыве ў ёй;
22 і хто прысягае небам, прысягае пасадам Божым і Тым, Хто сядзіць на ім.
23 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што даяцё дзесяціну з мяты, аніжу і кмену, і пакінулі найважнейшае ў Законе: суд, і міласэрнасьць, і веру; гэтае трэба было рабіць, і таго не пакідаць.

24 Павадыры сьляпыя, якія адцэджваеце камара, а глытаеце вярблюда!
25 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што ачышчаеце звонку келіх і місу, а ўнутры
яны напоўненыя рабункам і непаўстрыманасьцю.
26 Фарысэй сьляпы, ачысьці перш знутры келіх і місу, каб і звонку сталіся чыстымі.
27 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што падобныя да магілаў паваплены х,
якія звонку выглядаюць прыгожымі, а ўнутры напоўненыя косткамі мёртвых і ўсялякай
нячыстасьцю.
28 Гэтак і вы звонку выглядаеце людзям праведнымі, а ўнутры поўныя крывадушнасьці і
беззаконьня.
29 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што будуеце магілы прарокам, і аздабляеце
надмагільлі праведнікаў,
30 і кажаце: “Калі б мы былі ў дні бацькоў нашых, не былі б супольнікамі іхнімі ў крыві
прарокаў”.
31 Так што вы самі сьведчыце, што вы — сыны тых, якія забівалі прарокаў.
32 Дапаўняйце ж меру бацькоў вашых.
33 Зьмеі, спараджэньні яхідны, як уцячэце вы ад асуджэньня ў геенну?
34 Вось, дзеля гэтага Я пасылаю да вас прарокаў, і мудрых, і кніжнікаў; і вы адных заб’яцё і
ўкрыжуеце, і іншых будзеце біць у сынагогах вашых і гнаць з горада ў горад.
35 Няхай жа прыйдзе на вас уся кроў праведная, пралітая на зямлі, ад крыві Абэля праведнага
да крыві Захарыі, сына Барахіі, якога вы забілі між бажніцаю і ахвярнікам.
36 Сапраўды кажу вам, што ўсё гэтае прыйдзе на пакаленьне гэтае.
37 Ерусалім, Ерусалім, які забіваеш прарокаў і камянуеш пасланых да цябе! Колькі разоў хацеў
Я сабраць дзяцей тваіх, як птушка зьбірае птушанят сваіх пад крылы, і вы не захацелі.
38 Вось, пакідаецца вам дом ваш пусты.
39 Бо кажу вам: ня будзеце бачыць Мяне ад сёньня, пакуль ня скажаце: “Дабраслаўлёны Той,
Хто ідзе ў імя Госпада”».

Мц 24

1 І, выйшаўшы, Ісус ішоў ад сьвятыні; і падыйшлі вучні Ягоныя, каб паказаць Яму пабудовы
сьвятыні.
2 А Ісус сказаў ім: «Ці бачыце ўсё гэтае? Сапраўды кажу вам: не застанецца тут камяня на
камяні, які б ня быў зруйнаваны».
3 А калі сядзеў Ён на гары Аліўнай, падыйшлі да Яго вучні насамоце, кажучы: «Скажы нам,
калі гэта будзе, і які знак Твайго прыйсьця і сканчэньня веку?»
4 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Глядзіце, каб ніхто не падмануў вас,
5 бо многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы: “Я — Хрыстос”, — і шмат каго падмануць.
6 Маеце чуць пра войны і чуткі ваенныя. Глядзіце, не трывожцеся, бо ўсё гэта мусіць стацца,
але гэта яшчэ не канец.
7 Бо паўстане народ на народ і валадарства на валадарства; і будуць голад, і пошасьці, і
землятрусы месцамі.
8 А ўсё гэтае — пачатак мукаў радзін.
9 Тады будуць выдаваць вас на пакуты і забіваць вас, і зьненавідзяць вас усе народы за імя Маё.
10 І тады згоршацца многія; і будуць выдаваць адзін аднаго, і ненавідзець адзін аднаго.
11 І многія фальшывыя прарокі паўстануць, і падмануць многіх.
12 І дзеля памнажэньня беззаконьня ў многіх асьцюдзянее любоў.
13 А хто вытрывае да канца, будзе збаўлены.
14 І будзе абвешчанае гэтае Эвангельле Валадарства па ўсім сьвеце на сьведчаньне ўсім
народам, і тады прыйдзе канец.
15 Дык калі ўбачыце агіду спусташэньня, пра якую сказаў Даніил прарок, што паўстане на
месцы сьвятым, — хто чытае, няхай зразумее, —
16 тады тыя, што ў Юдэі, няхай бягуць у горы,

17 хто на даху, няхай не зыходзіць узяць што з дому свайго,
18 і хто ў полі, няхай не варочаецца назад узяць адзеньне сваё.
19 Гора ж тым, якія цяжарныя і якія кормяць грудзьмі, у тыя дні.
20 Маліцеся ж, каб ня сталіся ўцёкі вашыя зімою або ў суботу.
21 Бо тады будзе вялікі прыгнёт, якога не было ад пачатку сьвету аж дагэтуль, і ня будзе.
22 І калі б не былі скарочаныя тыя дні, не было б збаўленае ніводнае цела, але дзеля выбраных будуць скарочаныя тыя дні.
23 Тады, калі хто скажа вам: “Вось, тут Хрыстос, ці там”, — ня верце.
24 Бо паўстануць фальшывыя хрысты і фальшывыя прарокі і дадуць вялікія знакі і цуды, каб падмануць, калі магчыма, і выбраных.
25 Вось, Я наперад сказаў вам.
26 Дык, калі скажуць вам: “Вось, Ён у пустыні”, — не выходзьце; “Вось, Ён у пакоях”, — ня верце.
27 Бо, як бліскавіца выходзіць з усходу і сьвеціць да захаду, так будзе і прыйсьце Сына Чалавечага.
28 Бо дзе мёртвае цела, там зьбяруцца і арлы.
29 А адразу пасьля прыгнёту дзён тых сонца зацьмее, і месяц ня дасьць сьвятла свайго, і зоркі ўпадуць з неба, і сілы нябесныя захістаюцца.
30 І тады зьявіцца знак Сына Чалавечага ў небе, і тады заплачуць усе калены зямлі і ўгледзяць Сына Чалавечага, Які ідзе на аблоках нябесных з сілаю і славаю вялікаю.
31 І пашле Ён анёлаў Сваіх з гучным голасам трубным, і зьбяруць яны выбраных Ягоных ад чатырох вятроў, ад краю неба да краю яго.
32 У дрэва фігавага навучыцеся прыповесьці: калі ўжо галінка ягоная робіцца мяккаю і пускае лісты, ведаеце, што блізка лета.
33 Гэтак і вы, калі ўбачыце ўсё гэтае, ведайце, што блізка, у дзьвярах.
34 Сапраўды кажу вам: не праміне пакаленьне гэтае, як усё гэта станецца.
35 Неба і зямля прамінуць; а словы Мае не прамінуць.
36 А пра дзень той і гадзіну ніхто ня ведае, нават анёлы, якія ў небе, а толькі Айцец Мой адзін.
37 Але, як было ў дні Ноя, так будзе і ў прыйсьце Сына Чалавечага.
38 Бо як было ў дні перад патопам: елі, пілі, жаніліся і замуж выходзілі, аж да таго дня, як увайшоў Ной у каўчэг,
39 і не разумелі, пакуль не прыйшоў патоп і не забраў усіх, так будзе і ў прыйсьце Сына Чалавечага.
40 Тады будуць двое ў полі: адзін бярэцца, а другі пакідаецца.
41 Дзьве, якія мелюць у жорнах: адна бярэцца, а другая пакідаецца.
42 Дык чувайце, бо ня ведаеце, у якую гадзіну Госпад ваш прыйдзе.
43 Вы ж разумееце тое, што, калі б ведаў гаспадар дому, у якую варту прыйдзе злодзей, чуваў бы і не дапусьціў падкапаць дом свой.
44 Дзеля гэтага і вы будзьце падрыхтаваныя, бо Сын Чалавечы прыйдзе ў гадзіну, у якую ня думаеце.
45 Хто такі верны і мудры слуга, якога гаспадар ягоны паставіў над хатнімі сваімі даваць ім ежу ў свой час?
46 Шчасьлівы той слуга, якога гаспадар ягоны, прыйшоўшы, знойдзе, што робіць гэтак.
47 Сапраўды кажу вам, што над усёю маёмасьцю сваёю паставіць яго.
48 А калі скажа той злы слуга ў сэрцы сваім: “Марудзіць прыйсьці гаспадар мой”, —
49 і пачне біць таварышаў сваіх, таксама есьці і піць з п’яніцамі, —
50 прыйдзе гаспадар слугі таго ў дзень, у які ён не чакае, і ў гадзіну, у якую ня ведае,
51 і адлучыць яго, і ўчыніць яму адзін лёс з крывадушнікамі; там будзе плач і скрыгат зубоў.

Мц 25

1 Тады падобнае будзе Валадарства Нябеснае да дзесяці дзяўчынаў, якія, узяўшы лямпы свае, выйшлі насустрач жаніху.

2 А пяць з іх былі мудрыя, і пяць — дурныя.
3 Тыя, што былі дурныя, узяўшы лямпы свае, ня ўзялі з сабою алею.
4 А мудрыя ўзялі алей у пасудзінах сваіх разам з лямпамі сваімі.
5 А як жаніх замарудзіў, задрамалі ўсе і паснулі.
6 А сярод ночы ўзьняўся крык: “Вось, жаніх ідзе, выходзьце насустрач яму!”
7 Тады ўсталі ўсе тыя дзяўчыны і направілі лямпы свае.
8 Дурныя ж сказалі мудрым: “Дайце нам вашага алею, бо лямпы нашыя згасаюць”.
9 А мудрыя адказалі, кажучы: “Каб хапіла і нам, і вам, ідзіце лепш да прадаўцоў і купіце сабе”.
10 Калі ж пайшлі яны купляць, прыйшоў жаніх, і падрыхтаваныя ўвайшлі з ім на вясельле, і дзьверы былі зачыненыя.
11 А пасьля прыходзяць і другія дзяўчыны, кажучы: “Пане, пане! Адчыні нам!”
12 Ён жа, адказваючы, сказаў: “Сапраўды кажу вам: ня ведаю вас”.
13 Дык чувайце, бо ня ведаеце ані дня, ані гадзіны, у якую прыйдзе Сын Чалавечы.
14 Бо, як чалавек, выяжджаючы, паклікаў слугаў сваіх і даў ім маёмасьць сваю.
15 І аднаму даў пяць талентаў, а іншаму — два, а іншаму — адзін; кожнаму паводле сілы ягонай, і адразу выехаў.
16 Той, які ўзяў пяць талентаў, пайшоўшы, працаваў з імі і прыдбаў другія пяць талентаў.
17 Гэтаксама і той, [які ўзяў] два, прыдбаў і другія два.
18 А той, які ўзяў адзін, адыйшоўшы, закапаў яго ў зямлю і схаваў срэбра пана свайго.
19 Праз доўгі час прыходзіць пан слугаў тых і рахуецца з імі.
20 І, падыйшоўшы, той, які ўзяў пяць талентаў, прынёс другія пяць талентаў, кажучы: “Пане, пяць талентаў ты даў мне; вось другія пяць талентаў я прыдбаў на іх”.
21 А пан ягоны прамовіў да яго: “Добра, добры і верны слуга! У малым ты быў верны, над многім цябе пастаўлю; увайдзі ў радасьць пана твайго”.
22 Падыйшоўшы, той, які ўзяў два таленты, сказаў: “Пане, два таленты ты даў мне, вось, другія два таленты я прыдбаў на іх”.
23 Прамовіў да яго пан ягоны: “Добра, добры і верны слуга! У малым ты быў верны, над многім цябе пастаўлю; увайдзі ў радасьць пана твайго”.
24 А той, які ўзяў адзін талент, падыйшоўшы, сказаў: “Пане, я ведаю цябе, што ты — чалавек жорсткі, які жне, дзе ня сеяў, і зьбірае, дзе не рассыпаў.
25 І, збаяўшыся, я пайшоў і схаваў талент твой у зямлю; вось, трымай тваё”.
26 Адказваючы, пан ягоны сказаў яму: “Злы слуга і лянівы! Ты ведаў, што я жну, дзе ня сеяў, і зьбіраю, дзе не рассыпаў.
27 Дык мусіў ты аддаць срэбра маё купцам; і я, прыйшоўшы, атрымаў бы сваё з прыбыткам.
28 Дык вазьміце ў яго талент і дайце таму, які мае дзесяць талентаў.
29 Бо ўсякаму, хто мае, будзе дадзена і памножыцца, а ў таго, хто ня мае, і тое, што мае, будзе ўзята ў яго.
30 А нягоднага слугу кіньце ў цемру вонкавую; там будзе плач і скрыгат зубоў”.
31 А калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе Сваёй, і ўсе сьвятыя анёлы з Ім, тады Ён сядзе на пасадзе славы Сваёй.
32 І будуць сабраныя перад Ім усе народы; і Ён аддзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе авечак ад казлоў.
33 І паставіць авечак праваруч Сябе, а казлоў — леваруч.
34 Тады скажа Валадар тым, якія праваруч Яго: “Ідзіце, дабраслаўлёныя Айцом Маім, вазьміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад заснаваньня сьвету.
35 Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есьці; Я смагнуў, і вы напаілі Мяне; быў чужынцам, і вы прынялі Мяне,
36 быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязьніцы, і вы прыйшлі да Мяне”.

37 Тады адкажуць Яму праведнікі, кажучы: “Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галодным і
накармілі, ці сасьмяглым і напаілі?
38 Калі ж мы бачылі Цябе чужынцам і прынялі, ці голым і апранулі?
39 Калі ж мы бачылі Цябе хворым, ці ў вязьніцы, і прыйшлі да Цябе?”
40 І, адказваючы, Валадар скажа ім: “Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых
братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі”.
41 Тады скажа Ён і тым, якія леваруч: “Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, падрыхтаваны
д’яблу і анёлам ягоным.
42 Бо Я быў галодны, і вы ня далі Мне есьці; смагнуў, і вы не напаілі Мяне;
43 быў чужынцам, і вы не прынялі Мяне; быў голы, і вы не апранулі Мяне; быў хворы і ў
вязьніцы, і вы не адведалі Мяне”.
44 Тады і яны адкажуць Яму, кажучы: “Госпадзе, калі мы бачылі Цябе галодным, ці
сасьмяглым, ці чужынцам, ці голым, ці хворым, ці ў вязьніцы, і не паслужылі Табе?”
45 Тады адкажа Ён ім, кажучы: “Сапраўды кажу вам: тое, што вы не зрабілі аднаму з гэтых
меншых, Мне не зрабілі”.
46 І пойдуць гэтыя на пакараньне вечнае, а праведнікі — у жыцьцё вечнае».

Мц 26

1 І сталася, калі Ісус скончыў усе гэтыя словы, сказаў вучням Сваім:
2 «Вы ведаеце, што праз два дні будзе Пасха, і Сын Чалавечы будзе выдадзены на
ўкрыжаваньне».
3 Тады сабраліся першасьвятары, і кніжнікі, і старшыні народу на панадворак першасьвятара
на імя Каяфа.
4 І радзіліся яны, каб узяць Ісуса подступам і забіць.
5 Але казалі: «Ня ў сьвята, каб ня сталася замяшаньня ў народзе».
6 А Ісус быў у Бэтаніі, у доме Сымона пракажонага.
7 Падыйшла да Яго жанчына, якая мела алябастравы збанок міра шматкаштоўнага, і выліла на
галаву Ягоную, калі Ён узьлягаў.
8 Убачыўшы гэта, вучні Ягоныя абурыліся, кажучы: «Навошта гэткае марнаваньне?
9 Бо можна было добра прадаць гэтае міра і раздаць убогім».
10 А Ісус, зразумеўшы гэта, сказаў ім: «Што робіце прыкрасьць жанчыне? Бо яна добры ўчынак
зрабіла дзеля Мяне.
11 Бо ўбогіх заўсёды маеце з сабою, а Мяне не заўсёды маеце.
12 Бо выліўшы міра гэтае на цела Маё, яна ўчыніла гэта на пахаваньне Маё.
13 Сапраўды кажу вам: дзе толькі будзе абвешчана Эвангельле гэтае ў-ва ўсім сьвеце, будзе
сказана і пра тое, што яна зрабіла, на ўспамін пра яе».
14 Тады пайшоў адзін з Дванаццаці, называны Юда Іскарыёт, да першасьвятароў.
15 Ён сказаў: «Што хочаце мне даць, і я вам выдам Яго?» А яны паставілі яму трыццаць
срэбнікаў.
16 І з таго часу ён шукаў нагоды, каб выдаць Яго.
17 А ў першы дзень Праснакоў падыйшлі вучні да Ісуса, кажучы Яму: «Дзе хочаш падрыхтаваць
Табе есьці Пасху?»
18 Ён жа сказаў: «Ідзіце ў горад да такога і такога і скажыце яму: “Настаўнік гаворыць: 'Час
Мой блізкі; у цябе ўчыню Пасху з вучнямі Маімі'”».
19 І зрабілі вучні, як загадаў ім Ісус; і падрыхтавалі Пасху.
20 А калі настаў вечар, Ён узьлёг з Дванаццацьцю.
21 І, калі яны елі, Ён сказаў: «Сапраўды кажу вам, што адзін з вас выдасьць Мяне».
22 І, надта засмуціўшыся, яны пачалі гаварыць Яму, кожны з іх: «Ці ня я, Госпадзе?»
23 Ён жа, адказваючы, сказаў: «Той, які мачае са Мною руку ў місе, гэты выдасьць Мяне.

24 Сапраўды, Сын Чалавечы ідзе, як напісана пра Яго, але гора таму чалавеку, праз якога Сын
Чалавечы выдаецца; лепш было б яму, каб ня быў нарадзіўшыся чалавек гэты».
25 Адказваючы, Юда, які выдаў Яго, сказаў: «Ці ня я, Раббі?» Кажа яму: «Ты сказаў».
26 Калі ж яны елі, Ісус узяў хлеб, і, дабраславіўшы, паламаў, і даў вучням, і сказаў: «Бярыце,
ешце; гэта ёсьць Цела Маё».
27 І, узяўшы келіх і падзякаваўшы, даў ім, кажучы: «Піце з яго ўсе,
28 бо гэта ёсьць Кроў Мая Новага Запавету, якая праліваецца за многіх дзеля адпушчэньня
грахоў.
29 Кажу ж вам, што адгэтуль ня буду піць ад гэтага плоду вінаграднага аж да таго дня, калі
буду яго піць з вамі новае ў Валадарстве Айца Майго».
30 І, засьпяваўшы, яны пайшлі на гару Аліўную.
31 Тады кажа ім Ісус: «Усе вы згоршыцеся праз Мяне ў гэтую ноч, бо напісана: “Удару пастуха,
і будуць расьцярушаныя авечкі статку”.
32 Але пасьля ўваскрасеньня Майго прыйду перад вамі ў Галілею».
33 Адказваючы, Пётар сказаў Яму: «Калі і ўсе згоршацца праз Цябе, я ніколі ня згоршуся».
34 Сказаў яму Ісус: «Сапраўды кажу табе, што ў гэтую ноч, перш, чым певень запяе, тройчы
адрачэшся ад Мяне».
35 Кажа Яму Пётар: «Калі б мусіў і памерці з Табою, не адракуся ад Цябе». Таксама гаварылі і
ўсе вучні.
36 Тады ідзе з імі Ісус у месца, званае Гетсэманія, і кажа вучням: «Пасядзіце тут, пакуль Я,
адыйшоўшы, памалюся там».
37 І, узяўшы Пятра і абодвух сыноў Заўдыя, пачаў тужыць і сумаваць.
38 Тады кажа ім: «Смутная душа Мая аж да сьмерці, застаньцеся тут і чувайце са Мною».
39 І, адыйшоўшыся трохі, упаў на аблічча Сваё, молячыся і кажучы: «Ойча Мой! Калі магчыма,
няхай абміне Мяне келіх гэты; аднак не як Я хачу, але як Ты».
40 І прыходзіць да вучняў, і знаходзіць іх у сьне, і кажа Пятру: «Гэтак не маглі вы і аднае гадзіны
чуваць са Мною?
41 Чувайце і маліцеся, каб не ўвайсьці ў спакусу. Сапраўды, дух ахвочы, а цела кволае».
42 Ізноў, другі раз адыйшоўшы, маліўся, кажучы: «Ойча Мой! Калі ня можа келіх гэты
абмінуць Мяне, каб Мне ня піць яго, няхай станецца воля Твая!»
43 І, прыйшоўшы, знаходзіць іх ізноў у сьне; бо вочы іхнія абцяжэлі.
44 І, пакінуўшы іх, адыйшоўшы, маліўся трэці раз, кажучы тое самае слова.
45 Тады прыходзіць да вучняў Сваіх і кажа ім: «Сьпіцё яшчэ і адпачываеце? Вось, наблізілася
гадзіна, і Сын Чалавечы будзе выдадзены ў рукі грэшнікаў.
46 Уставайце, хадзем! Вось, наблізіўся той, хто Мяне выдае».
47 І калі Ён яшчэ гаварыў, вось, прыйшоў Юда, адзін з Дванаццаці, і з ім шматлікі натоўп з
мячамі і каламі ад першасьвятароў і старшыняў народу.
48 А той, што выдаваў Яго, даў ім знак, кажучы: «Каго я пацалую, гэта Ён; бярыце Яго».
49 І адразу, падыйшоўшы да Ісуса, сказаў: «Радуйся, Раббі!», і пацалаваў Яго.
50 А Ісус сказаў яму: «Дружа, дзеля чаго ты прыйшоў?» Тады тыя, што прыйшлі, усклалі рукі
на Ісуса і ўзялі Яго.
51 І вось, адзін з тых, што былі з Ісусам, выцягнуўшы руку, выхапіў меч свой і, ударыўшы слугу
першасьвятара, адсек яму вуха.
52 Тады кажа яму Ісус: «Вярні меч твой на месца ягонае; бо ўсе, што ўзялі меч, ад мяча
загінуць.
53 Ці ты думаеш, што Я ня маю сілы цяпер упрасіць Айца Майго, і Ён паставіць побач Мяне
больш за дванаццаць легіёнаў анёлаў?
54 Як жа споўніцца Пісаньне, што гэта мусіць стацца?»
55 У тую гадзіну сказаў Ісус натоўпу: «Быццам на разбойніка выйшлі вы з мячамі і каламі
схапіць Мяне. Кожны дзень сядзеў Я з вамі, навучаючы ў сьвятыні, і вы не хапалі Мяне.

56 А гэта ўсё сталася, каб споўніліся Пісаньні прарокаў». Тады ўсе вучні, пакінуўшы Яго,
паўцякалі.
57 А тыя, што схапілі Ісуса, завялі [Яго] да першасьвятара Каяфы, дзе былі сабраныя кніжнікі і
старшыні.
58 Пётар жа ішоў за Ім здалёк аж да панадворку першасьвятара; і, увайшоўшы ў сярэдзіну, сеў
з паслугачамі, каб бачыць канец.
59 А першасьвятары і старшыні, і ўвесь сынэдрыён шукалі фальшывага сьведчаньня супраць
Ісуса, каб забіць Яго,
60 і не знаходзілі. І многія фальшывыя сьведкі, што прыходзілі, не знайшлі. Нарэшце, два
фальшывыя сьведкі, якія прыйшлі,
61 сказалі: «Ён прамаўляў: “Магу зруйнаваць бажніцу Божую і ў тры дні збудаваць яе”».
62 І, устаўшы, першасьвятар сказаў Яму: «Ты нічога не адказваеш? Што яны супраць Цябе
сьведчаць?»
63 А Ісус маўчаў. І, адказваючы, першасьвятар сказаў Яму: «Заклінаю Цябе Богам Жывым, каб
Ты сказаў нам, ці Ты — Хрыстос, Сын Божы?»
64 Кажа яму Ісус: «Ты сказаў. Да таго кажу вам: адгэтуль угледзіце Сына Чалавечага, Які
сядзіць праваруч Моцы і ідзе на аблоках нябесных».
65 Тады першасьвятар разьдзёр шаты свае, кажучы: «Ён блюзьніць! Якую яшчэ маем патрэбу
ў сьведках? Вось, цяпер вы пачулі блюзьнерства Ягонае.
66 Што вы думаеце?» Яны ж, адказваючы, сказалі: «Ён варты сьмерці».
67 Тады плявалі Яму ў аблічча і білі Яго; а іншыя білі Яго па шчоках,
68 кажучы: «Прароч нам, Хрыстос, хто ўдарыў Цябе?»
69 А Пётар сядзеў звонку, на панадворку, і падыйшла да яго адна служка, кажучы: «І ты быў з
Ісусам Галілейцам».
70 Ён жа адрокся перад усімі, кажучы: «Ня ведаю, што ты кажаш».
71 Калі ж ён выходзіў за браму, убачыла яго другая і кажа тым, якія былі там: «І гэты быў з
Ісусам з Назарэту».
72 І ён ізноў адрокся з прысягаю, што ня ведае Чалавека Гэтага.
73 Неўзабаве тыя, што падыйшлі і стаялі там, сказалі Пятру: «Праўда, і ты з іх, бо і гаворка твая
выяўляе цябе».
74 Тады ён пачаў бажыцца і прысягаць, што ня ведае Чалавека Гэтага. І адразу запяяў певень.
75 І ўзгадаў Пётар слова Ісуса, сказанае яму: «Перш, чым певень запяе, тройчы адрачэшся ад
Мяне». І, выйшаўшы вонкі, заплакаў горка.

Мц 27

1 А калі настала раніца, усе першасьвятары і старшыні народу мелі нараду адносна Ісуса, каб
забіць Яго.
2 І, зьвязаўшы Яго, павялі і выдалі Яго Понтыю Пілату, ваяводзе.
3 Тады Юда, які выдаў Яго, убачыўшы, што Ён асуджаны, пакаяўшыся, зьвярнуў трыццаць
срэбнікаў першасьвятарам і старшыням,
4 кажучы: «Саграшыў я, выдаўшы кроў бязьвінную». Яны ж сказалі яму: «Што нам да гэтага?
Глядзі сам».
5 І, кінуўшы срэбра ў бажніцы, ён выйшаў і, адыйшоўшы, павесіўся.
6 А першасьвятары, узяўшы срэбра, сказалі: «Нельга кінуць яго ў скарбонку, бо яно — цана
крыві».
7 Зрабіўшы ж нараду, яны купілі за яго поле ганчара, каб хаваць чужынцаў.
8 Дзеля гэтага завецца поле тое “полем крыві” аж да сёньня.
9 Тады споўнілася сказанае праз Ярэмію прарока, які кажа: «І ўзялі трыццаць срэбнікаў, цану
Ацэненага, Якога ацанілі сыны Ізраіля,
10 і далі іх за поле ганчара, як загадаў мне Госпад».

11 А Ісус стаў перад ваяводам; і спытаўся ў Яго ваявода, кажучы: «Ты — Валадар Юдэйскі?»
Ісус жа сказаў яму: «Ты кажаш».
12 І, калі абвінавачвалі Яго першасьвятары і старшыні, Ён нічога не адказваў.
13 Тады кажа Яму Пілат: «Ня чуеш, колькі сьведчаць супраць Цябе?»
14 І не адказаў яму ніводнага слова, так што ваявода надта дзівіўся.
15 А на сьвята ваявода меў звычай вызваляць натоўпу аднаго вязьня, якога яны хочуць.
16 Мелі ж тады знакамітага вязьня, называнага Барабба.
17 Дык калі яны сабраліся, сказаў ім Пілат: «Каго хочаце, каб я вызваліў вам: Бараббу ці Ісуса,
называнага Хрыстом?»
18 Бо ведаў, што праз зайздрасьць выдалі Яго.
19 Калі ён сядзеў на судовым пасадзе, жонка ягоная паслала да яго, кажучы: «Няма чаго
[рабіць] табе і Праведніку Гэтаму, бо я шмат перацярпела сёньня ў-ва сьне дзеля Яго».
20 Але першасьвятары і старшыні пераканалі натоўп, каб прасілі Бараббу, а Ісуса загубілі.
21 Адказваючы, ваявода сказаў ім: «Каго хочаце з гэтых двух, каб я вызваліў вам?» Яны ж
сказалі: «Бараббу».
22 Кажа ім Пілат: «Што тады я ўчыню Ісусу, называнаму Хрыстом?» Кажуць яму ўсе: «Няхай
будзе ўкрыжаваны!»
23 А ваявода сказаў: «Дык якое зло ўчыніў Ён?» А яны яшчэ мацней закрычалі, кажучы:
«Няхай будзе ўкрыжаваны!»
24 Пілат, бачачы, што няма ніякай рады, але замяшаньне стаецца яшчэ большае, узяўшы ваду,
памыў рукі перад натоўпам, кажучы: «Бязьвінны я ў крыві Праведніка Гэтага. Вы глядзіце».
25 І, адказваючы, увесь народ сказаў: «Кроў Ягоная на нас і на дзецях нашых!»
26 Тады ён вызваліў ім Бараббу, а Ісуса, убічаваўшы, выдаў, каб быў укрыжаваны.
27 Тады жаўнеры ваяводы, узяўшы Ісуса ў прэторыю, сабралі на Яго ўсю кагорту.
28 І, зьняўшы з Яго [ўсё], усклалі на Яго плашч пунсовы,
29 і, сплёўшы вянок з церня, усклалі на галаву Ягоную, і [далі] трысьціну ў правую руку Ягоную,
і, кленчучы перад Ім, зьдзекваліся з Яго, кажучы: «Радуйся, Валадару Юдэйскі!»
30 І тыя, што плявалі на Яго, узялі трысьціну, і білі па галаве Ягонай.
31 І, калі назьдзекваліся з Яго, зьнялі з Яго плашч, і апранулі Яго ў адзеньне Ягонае, і павялі
Яго на ўкрыжаваньне.
32 А выходзячы, яны знайшлі чалавека Кірэнэйца, на імя Сымон; яго прымусілі несьці крыж
Ягоны.
33 І прыйшлі на месца, называнае Галгофа, што азначае Месца Чэрапа.
34 Яны далі Яму піць воцат, зьмяшаны з жоўцю; і, пакаштаваўшы, Ён не захацеў піць.
35 А тыя, што ўкрыжавалі Яго, падзялілі адзеньне Ягонае, кідаючы жэрабя, каб споўнілася
сказанае праз прарока: «Падзялілі адзеньне маё між сабою і пра вопратку маю кідалі жэрабя».
36 І, пасеўшы, пільнавалі Яго там.
37 І зьмясьцілі над галавою Яго надпіс пра віну Ягоную: «Гэта Ісус, Валадар Юдэйскі».
38 Тады былі ўкрыжаваныя з Ім разам два разбойнікі: адзін — праваруч, а другі — леваруч.
39 А тыя, што праходзілі міма, блюзьнілі на Яго, ківаючы галовамі сваімі
40 і кажучы: «Ты, Які руйнуеш бажніцу і ў тры дні адбудоўваеш, збаў Сябе Самога! Калі Ты —
Сын Божы, зыйдзі з крыжа!»
41 Таксама і першасьвятары з кніжнікамі і старшынямі, зьдзекуючыся, казалі:
42 «Іншых збаўляў, а Сябе ня можа збавіць! Калі Ён — Валадар Ізраіля, няхай зыйдзе цяпер з
крыжа, і мы паверым Яму.
43 Спадзяваўся на Бога, няхай Ён цяпер выбавіць Яго, калі хоча Яго. Бо Ён казаў: “Я — Сын
Божы”».
44 Да таго і разбойнікі, укрыжаваныя разам з Ім, зьневажалі Яго.
45 А ад шостае гадзіны цемра сталася па ўсёй зямлі да гадзіны дзявятае.
46 Каля ж дзявятае гадзіны загаласіў Ісус моцным голасам: «Элі! Элі! Лама сабахтані?», што
значыць: «Божа Мой! Божа Мой! Чаму Ты Мяне пакінуў?»

47 А некаторыя з тых, што там стаялі, пачуўшы, казалі: «Ён Ільлю кліча».
48 І адразу адзін з іх, пабегшы, і ўзяўшы губку, і напоўніўшы яе воцатам, і ўсклаўшы на
трысьціну, даваў Яму піць.
49 А іншыя казалі: «Пакінь, паглядзім, ці прыйдзе Ільля збавіць Яго».
50 А Ісус, зноў усклікнуўшы моцным голасам, аддаў духа.
51 І вось, заслона ў бажніцы была разьдзёртая надвое ад верху да нізу; і зямля затрэслася; і
скалы разьдзерліся.
52 І магілы адчыніліся; і шмат целаў памёршых сьвятых паўстала,
53 і, выйшаўшы з магілаў, пасьля ўваскрасеньня Ягонага ўвайшлі ў сьвяты горад і зьявіліся
многім.
54 Сотнік жа і тыя, што з ім пільнавалі Ісуса, убачыўшы землятрус і тое, што сталася, страхам
напалохаліся, кажучы: «Праўда, Ён — Сын Божы».
55 Было там шмат жанчынаў, што глядзелі здалёк, якія ішлі за Ісусам з Галілеі, паслугуючы
Яму.
56 Між імі былі Марыя Магдалена, і Марыя, маці Якуба і Ёсіі, і маці сыноў Заўдыя.
57 А калі настаў вечар, прыйшоў багаты чалавек з Арыматэі, на імя Язэп, які таксама быў
вучнем Ісуса.
58 Ён, падыйшоўшы да Пілата, прасіў цела Ісуса. Тады Пілат загадаў аддаць цела.
59 І, узяўшы цела, Язэп абкруціў Яго чыстай палатнінаю
60 і палажыў Яго ў сваёй новай магіле, якую ён высек у скале; і, прываліўшы вялікі камень да
ўваходу ў магілу, адыйшоў.
61 Былі ж там Марыя Магдалена і другая Марыя, якія сядзелі насупраць магілы.
62 А на наступны дзень, які пасьля дня прыгатаваньня, сабраліся першасьвятары і фарысэі ў
Пілата,
63 кажучы: «Пане! Мы ўзгадалі, што падманшчык той, як быў яшчэ жывы, казаў: “Праз тры
дні ўваскрэсну”.
64 Дык загадай вартаваць магілу да трэцяга дня, каб не прыйшлі вучні Ягоныя ўначы, і ня
ўкралі Яго, і не сказалі народу: “Ён уваскрос з мёртвых”. І будзе апошні падман горшы за
першы».
65 Пілат жа прамовіў да іх: «Маеце варту; ідзіце, вартуйце, як ведаеце».
66 Яны ж, пайшоўшы, вартавалі магілу з вартаю, запячатаўшы камень.

Мц 28

1 Пасьля суботы, пры надыходзе першага дня пасьля суботы, прыйшла Марыя Магдалена і
другая Марыя паглядзець магілу.
2 І вось, стаўся вялікі землятрус; бо анёл Госпада, зыйшоўшы з неба, падыйшоўшы, адваліў
камень ад уваходу ў магілу і сеў на ім.
3 А выгляд ягоны быў, як бліскавіца, і адзеньне ягонае белае, як сьнег.
4 І ад страху перад ім затрэсьліся вартаўнікі і сталіся як мёртвыя.
5 А анёл, адказваючы, сказаў жанчынам: «Ня бойцеся! Бо ведаю, што вы шукаеце Ісуса
ўкрыжаванага.
6 Яго няма тут, бо Ён уваскрос, як казаў. Хадзіце, паглядзіце месца, дзе ляжаў Госпад.
7 І, хутка пайшоўшы, скажыце вучням Ягоным, што Ён уваскрос з мёртвых, і вось, ідзе перад
вамі ў Галілею; там Яго ўбачыце. Вось, я сказаў вам».
8 І, выйшаўшы хутка з магілы, яны са страхам і радасьцю вялікай пабеглі паведаміць вучням
Ягоным.
9 Калі ж яны ішлі паведаміць вучням Ягоным, вось, Ісус сустрэў іх, кажучы: «Радуйцеся!» І
яны, падыйшоўшы, абнялі ногі Ягоныя, і пакланіліся Яму.
10 Тады кажа ім Ісус: «Ня бойцеся! Ідзіце, паведаміце братам Маім, каб ішлі ў Галілею; і там
яны ўгледзяць Мяне».
11 Калі ж яны ішлі, вось, некаторыя з вартаўнікоў, пайшоўшы ў горад, паведамілі
першасьвятарам усё, што сталася.

12 І тыя, сабраўшыся са старшынямі і зрабіўшы нараду, далі даволі грошаў жаўнерам,
13 кажучы: «Скажыце, што вучні Ягоныя, прыйшоўшы ўначы, укралі Яго, калі вы спалі.
14 І, калі пачуе пра гэта ваявода, мы пераканаем яго, і вам учынім, каб ня мелі клопату».
15 Яны ж, узяўшы грошы, зрабілі, як іх навучылі. І пашырылася слова гэтае між Юдэямі аж да сёньня.
16 А адзінаццаць вучняў пайшлі ў Галілею на гару, куды вызначыў ім Ісус.
17 І, убачыўшы Яго, пакланіліся Яму; а некаторыя сумняваліся.
18 І, падыйшоўшы, Ісус сказаў ім, кажучы: «Дадзена Мне ўся ўлада ў небе і на зямлі.
19 Дык ідзіце, вучыце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа,
20 навучаючы іх захоўваць усё, што Я загадаў вам. І вось, Я з вамі ў-ва ўсе дні да сканчэньня веку». Амэн.

ЭВАНГЕЛЬЛЕ ПАВОДЛЕ МАРКА

1 Пачатак Эвангельля Ісуса Хрыста, Сына Божага.
2 Як напісана ў Прарокаў: «Вось Я пасылаю анёла Майго перад абліччам Тваім, які пракладзе
шлях Твой перад Табою.
3 Голас таго, хто кліча ў пустыні: Падрыхтуйце шлях Госпаду, простымі рабіце сьцежкі Яго».
4 Зьявіўся Ян, хрысьцячы ў пустыні і абвяшчаючы хрышчэньне навяртаньня дзеля
адпушчэньня грахоў.
5 І выходзіла да яго ўся краіна Юдэйская і ўсе Ерусалімцы, і ўсе былі ім хрышчаны ў рацэ Ярдан,
вызнаючы грахі свае.
6 І быў Ян апрануты ў вярблюдавы волас, і скураны пояс на паясьніцы яго, і еў ён саранчу і
дзікі мёд.
7 І абвяшчаў ён, кажучы: «Ідзе за мной Дужэйшы за мяне, Якому я ня варты, нахіліўшыся,
разьвязаць рамень сандалаў Ягоных.
8 Я хрышчу вас вадой, а Ён будзе хрысьціць вас Духам Сьвятым».
9 І сталася ў тыя дні, прыйшоў Ісус з Назарэту Галілейскага і быў ахрышчаны Янам у Ярдане.
10 І адразу, як выходзіў з вады, убачыў адкрытае неба і Духа, як голуба, што зыходзіў на Яго.
11 І голас быў з неба: «Ты — Сын Мой улюбёны, у Якім маю ўпадабаньне».
12 І адразу Дух вядзе Яго ў пустыню.
13 І быў Ён там у пустыні сорак дзён, спакушваны шатанам; і быў між зьвяроў, і анёлы
паслугавалі Яму.
14 А пасьля таго, як Ян быў выдадзены, прыйшоў Ісус у Галілею, абвяшчаючы Эвангельле
Валадарства Божага
15 і кажучы, што споўніўся час і наблізілася Валадарства Божае: «Навярніцеся і верце ў
Эвангельле!»
16 І, праходзячы каля мора Галілейскага, убачыў Сымона і Андрэя, брата ягонага, што закідвалі
[нерат] у мора, бо былі яны рыбаловамі.
17 І сказаў ім Ісус: «Ідзіце за Мною, і Я зраблю вас лаўцамі людзей».
18 І адразу, пакінуўшы сеткі свае, яны пайшлі за Ім.
19 І, адыйшоўшыся адтуль недалёка, убачыў Ён Якуба Заўдыявага і Яна, брата ягонага, як яны
ў чаўне напраўлялі сеткі.
20 І адразу паклікаў іх. І яны, пакінуўшы бацьку свайго Заўдыя ў чаўне з работнікамі, пайшлі
за Ім.
21 І ўваходзяць у Капэрнаум. І адразу ў суботу, увайшоўшы ў сынагогу, Ён навучаў.
22 І ўсе дзівіліся з вучэньня Ягонага, бо Ён вучыў іх як той, хто мае ўладу, а не як кніжнікі.
23 І быў у сынагозе іхняй чалавек, [апанаваны] духам нячыстым, і закрычаў ён,
24 кажучы: «Пакінь! Што нам і Табе, Ісус Назарэец? Ты прыйшоў загубіць нас? Ведаю Цябе,
хто Ты, Сьвяты Божы!»
25 Але прыгразіў яму Ісус, кажучы: «Замаўчы і выйдзі з яго!»
26 І нячысты дух, тузануўшы яго і загаласіўшы моцным голасам, выйшаў з яго.
27 І аслупянелі ўсе, таму пыталіся адзін аднаго, кажучы: «Што гэта? Што гэта за новае
вучэньне, што з уладаю загадвае нячыстым духам, і яны слухаюцца Яго?»
28 І адразу пайшла чутка пра Яго паўсюль у-ва ўсёй ваколіцы Галілейскай.
29 І, адразу выйшаўшы з сынагогі, прыйшлі яны ў дом Сымона і Андрэя разам з Якубам і Янам.
30 Цешча ж Сымона ляжала ў гарачцы, і адразу кажуць Яму пра яе.
31 І, падыйшоўшы, Ён падняў яе, узяўшы за руку, і адразу пакінула яе гарачка, і яна паслугавала
ім.
32 А калі настаў вечар, як сонца зайшло, прыносілі да Яго ўсіх хворых і апанаваных дэманамі;
33 і ўвесь горад сабраўся перад дзьвярыма.

34 І Ён аздаравіў многіх хворых на розныя хваробы, і многіх дэманаў выгнаў, і не дазваляў
дэманам гаварыць, што яны ведаюць, што Ён — Хрыстос.
35 І раніцай, на самым досьвітку ўстаўшы, выйшаў, і пайшоў у пустыннае месца, і там маліўся.
36 І пайшлі за Ім Сымон і тыя, што з ім [былі],
37 і, знайшоўшы Яго, кажуць Яму: «Усе шукаюць Цябе».
38 А Ён кажа ім: «Хадзем у бліжэйшыя паселішчы, каб і там Я абвяшчаў, бо Я дзеля гэтага
прыйшоў».
39 І Ён абвяшчаў у сынагогах іхніх па ўсёй Галілеі і выганяў дэманаў.
40 І прыходзіць да Яго пракажоны, просячы Яго і падаючы перад Ім на калені, і кажучы Яму:
«Калі хочаш, можаш мяне ачысьціць».
41 Дык Ісус, зьлітаваўшыся, працягнуў руку і дакрануўся да яго, і кажа яму: «Хачу, будзь
ачышчаны».
42 І калі сказаў, адразу зыйшла з яго праказа і стаў ачышчаны.
43 І, грозна глянуўшы на яго, адразу выправіў яго,
44 і сказаў яму: «Глядзі, нікому нічога не кажы, але ідзі, пакажыся сьвятару і прынясі за
ачышчэньне сваё тое, што загадаў Майсей, дзеля сьведчаньня ім».
45 Але ён, выйшаўшы, пачаў шмат абвяшчаць і шырыць кругом гэта слова, што [Ісус] ужо ня
мог адкрыта ўвайсьці ў горад, але быў вонкі, у мясьцінах пустынных. І прыходзілі да Яго
адусюль.

Мк 2

1 І праз [некалькі] дзён Ён зноў увайшоў у Капэрнаум, і пачулі, што Ён у доме.
2 І адразу сабралася мноства, што нават пры дзьвярах не маглі зьмясьціцца, і Ён гаварыў ім
слова.
3 І прыходзяць да Яго са спараліжаваным, якога несьлі чацьвёра.
4 І, ня здолеўшы прайсьці да Яго дзеля натоўпу, раскрылі дах там, дзе Ён быў, і, зрабіўшы дзіру,
спусьцілі ложак, на якім ляжаў спараліжаваны.
5 І Ісус, убачыўшы веру іхнюю, кажа спараліжаванаму: «Дзіця, адпускаюцца грахі твае».
6 Былі ж там некаторыя кніжнікі, якія сядзелі і разважалі ў сэрцах сваіх:
7 «Што гэта Ён кажа блюзьнерства? Хто можа адпускаць грахі, калі ня Сам Бог?»
8 А Ісус, адразу пазнаўшы духам Сваім, што яны гэтак думаюць, кажа ім: «Што вы гэтак
разважаеце ў сэрцах вашых?
9 Што лягчэй, сказаць спараліжаванаму: “Адпускаюцца твае грахі”, ці сказаць: “Устань, вазьмі
ложак твой і хадзі”?
10 Але, каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі», — кажа
спараліжаванаму:
11 «Табе кажу: “Устань, вазьмі ложак твой і ідзі ў дом твой”».
12 І той адразу ўстаў і, узяўшы ложак, выйшаў перад усімі, так што ўсе дзівіліся і славілі Бога,
кажучы: «Мы такога ніколі ня бачылі».
13 І зноў выйшаў [Ісус] да мора, і ўвесь натоўп пайшоў да Яго, і Ён навучаў іх.
14 І, праходзячы, убачыў Ён Левія Алфеявага, які сядзеў на мытні, і кажа яму: «Ідзі за Мною!»
І той, устаўшы, пайшоў за Ім.
15 І сталася, калі Ён узьлягаў у доме ягоным, узьлягала разам з Ісусам і вучнямі Ягонымі шмат
мытнікаў і грэшнікаў, бо было многа іх, і яны ішлі за Ім.
16 А кніжнікі і фарысэі, бачачы, што [Ісус] есьць з мытнікамі і грэшнікамі, казалі вучням
Ягоным: «Чаму Ён есьць і п’е з мытнікамі і грэшнікамі?»
17 І, пачуўшы гэта, Ісус кажа ім: «Не здаровыя патрабуюць лекара, але хворыя. Я прыйшоў
клікаць ня праведнікаў, але грэшнікаў да навяртаньня».
18 І посьцілі вучні Янавы і фарысэйскія. Дык прыходзяць і кажуць Яму: «Чаму вучні Янавы і
фарысэйскія посьцяць, а Твае вучні ня посьцяць?»
19 І сказаў ім Ісус: «Ці ж могуць посьціць сыны вясельля, калі малады з імі? Пакуль маюць
жаніха ў сябе, ня могуць посьціць.

20 А надыйдуць дні, калі жаніха забяруць ад іх, і тады будуць посьціць у тыя дні.
21 Ніхто не прышывае латкі з новай тканіны да старога адзеньня, бо новая латка разьдзярэ
старое, і дзіра зробіцца большая.
22 І ніхто не ўлівае новага віна ў старыя мяхі, бо новае віно прарве мяхі, і віно выцячэ, і мяхі
прападуць; але новае віно трэба ўліваць у новыя мяхі».
23 І сталася Яму ў суботу праходзіць праз палеткі, і вучні Ягоныя пачалі дарогаю зрываць
каласы.
24 І фарысэі гаварылі Яму: «Глядзі, чаму яны робяць у суботу, што ня сьлед!»
25 А Ён сказаў ім: «Ці ж вы не чыталі, што зрабіў Давід, калі быў у патрэбе і галодны сам і тыя,
што з ім?
26 Як увайшоў ён у Дом Божы ў [дні] Абіятара першасьвятара і еў хлябы пакладныя, якія нельга
яму было есьці, а толькі сьвятарам, і даў таксама тым, што з ім былі?»
27 І казаў ім: «Субота для чалавека, а не чалавек для суботы.
28 Таму Сын Чалавечы ёсьць Гаспадар і суботы».

Мк 3

1 І зноў увайшоў у сынагогу. І быў там чалавек, які меў сухую руку.
2 І сачылі за Ім, ці не аздаровіць яго ў суботу, каб абвінаваціць Яго.
3 І Ён кажа сухарукаму чалавеку: «Стань на сярэдзіне!»
4 І кажа ім: «Ці належыць у суботу рабіць добрае, ці рабіць благое? Душу выратаваць ці
загубіць?» Але яны маўчалі.
5 І, глянуўшы на іх з гневам, смуткуючы дзеля скамяненьня сэрца іхняга, кажа чалавеку
гэтаму: «Выцягні руку тваю!» І ён выцягнуў, і зрабілася рука яго здаровая, як і другая.
6 Фарысэі ж, выйшаўшы, зрабілі адразу нараду з ірадыянамі супраць Яго, каб Яго загубіць.
7 І Ісус разам з вучнямі Сваімі адыйшоў да мора, і вялікае мноства пайшло за Ім з Галілеі, і з
Юдэі,
8 і з Ерусаліму, і з Ідумеі, і з-за Ярдану, і з ваколіцаў Тыру і Сідону, вялікае мноства, пачуўшы,
што Ён рабіў, прыйшло да Яго.
9 І сказаў вучням Сваім, каб быў падрыхтаваны для Яго човен дзеля натоўпу, каб ня ціснулі
Яго.
10 Бо многіх Ён аздаравіў, таму пхаліся да Яго ўсе, што мелі немачы, каб дакрануцца да Яго.
11 І духі нячыстыя, калі бачылі Яго, падалі перад Ім і крычалі, кажучы: «Ты — Сын Божы!»
12 Але Ён строга забараняў ім, каб не выяўлялі Яго.
13 І ўзыходзіць на гару, і кліча тых, якіх Сам хацеў, і прыйшлі да Яго.
14 І вызначыў Дванаццаць, каб былі з Ім і каб пасылаць іх абвяшчаць,
15 і каб мелі ўладу аздараўляць хваробы і выганяць дэманаў:
16 Сымона, і даў яму імя Пётар,
17 і Якуба Заўдыявага, і Яна, брата Якуба, і даў ім імя Боанэргес, што значыць “Сыны грому”,
18 і Андрэя, і Філіпа, і Барталамея, і Мацьвея, і Тамаша, і Якуба Алфеявага, і Тадэвуша, і Сымона
Кананіта,
19 і Юду Іскарыёта, які выдаў Яго.
20 І прыходзяць у дом; і зноў зыходзіцца натоўп, так што не маглі яны нават хлеба паесьці.
21 І, пачуўшы [гэта], сваякі Ягоныя пайшлі ўзяць Яго, бо казалі, што Ён зьдзівачэў.
22 А кніжнікі, што прыйшлі з Ерусаліму, гаварылі, што мае Бэльзэбула і што моцай князя
дэманаў выганяе дэманаў.
23 І, паклікаўшы іх, гаварыў да іх [Ісус] у прыповесьцях: «Як можа шатан выганяць шатана?
24 І калі валадарства разьдзеліцца ў сабе, ня можа ўтрымацца валадарства тое.
25 І калі дом разьдзеліцца ў сабе, ня можа ўтрымацца дом той.
26 І калі шатан паўстаў на сябе самога і разьдзяліўся, ня можа ўтрымацца, але канец яму.
27 Ніхто, увайшоўшы ў дом асілка, ня можа захапіць маёмасьць ягоную, калі перш ня зьвяжа
асілка, і тады абрабуе дом ягоны.

28 Сапраўды кажу вам, што будуць адпушчаны сынам чалавечым усе грахі і блюзьнерствы, якімі б яны ні блюзьнілі,
29 але хто будзе блюзьніць на Духа Сьвятога, ня будзе яму адпушчана ў вякі, але падлягае асуджэньню вечнаму».
30 Бо яны гаварылі: «Мае духа нячыстага».
31 І прыходзяць браты Ягоныя і маці Ягоная, і, стоячы вонкі, паслалі да Яго клікаць Яго.
32 І сядзеў кругом Яго натоўп, і сказалі Яму: «Вось, маці Твая і браты Твае вонкі, яны шукаюць Цябе».
33 І, адказваючы ім, гаворыць: «Хто маці Мая і браты Мае?»
34 І, агледзеўшы наўкола тых, што каля Яго сядзелі, кажа: «Вось маці Мая і браты Мае!
35 Бо хто выконвае волю Божую, той Мне брат, і сястра, і маці».

Мк 4

1 І зноў Ён пачаў навучаць каля мора; і сабраўся да Яго вялізарны натоўп, так што Ён, увайшоўшы ў човен, сядзеў у моры, а ўвесь натоўп быў на беразе каля мора.
2 І навучаў іх шмат у прыповесьцях, і гаварыў ім у вучэньні Сваім:
3 «Слухайце. Вось выйшаў сейбіт сеяць.
4 І сталася, калі сеяў, адно [зерне] ўпала пры дарозе; і наляцелі птушкі нябесныя і падзяўблі яго.
5 Іншае ўпала на камяністае месца, дзе не было шмат зямлі, і адразу ўзыйшло, бо зямля была неглыбокая;
6 а калі ўзыйшло сонца, зьвяла, і, як ня мела кораня, высахла.
7 А іншае ўпала ў церні, і вырасьлі церні, і заглушылі яго, і не дало плоду.
8 А іншае ўпала ў добрую зямлю і дало плод, які ўзыйшоў і вырас, і ўрадзіла адно — трыццаць, адно — шэсьцьдзясят, і адно — сто».
9 І сказаў ім: «Хто мае вушы, каб слухаць, няхай слухае».
10 Калі ж Ён застаўся Сам, тыя, што з Ім былі, разам з Дванаццацьцю спыталіся ў Яго адносна прыповесьці.
11 І сказаў Ён ім: «Вам дадзена разумець таямніцу Валадарства Божага; а тым, якія вонкі, усё стаецца ў прыповесьцях,
12 каб гледзячы глядзелі, і ня бачылі, і каб слухаючы слухалі, і не разумелі, каб не навярнуліся і не былі ім адпушчаны грахі».
13 І кажа ім: «Не разумееце гэтай прыповесьці? А як жа ўсе прыповесьці зразумееце?
14 Сейбіт слова сее.
15 Вось тыя, што пры дарозе, дзе сеецца слова, калі пачуюць яго, адразу прыходзіць шатан і забірае слова, пасеянае ў сэрцах іхніх.
16 Таксама і тыя, што на камяністым месцы пасеяны, пачуўшы слова, адразу з радасьцю прыймаюць яго,
17 але ня маюць у сабе кораня, таму нетрывалыя; калі надыйдзе прыгнёт ці перасьлед дзеля слова, адразу ж горшацца.
18 А тыя, што ў цернях пасеяныя, чуюць слова,
19 але клопаты веку гэтага і ашуканства багацьця ды іншыя пажаданьні, уваходзячы, заглушаюць слова, і яно стаецца бясплодным.
20 А тыя, што пасеяныя ў добрую зямлю, гэта тыя, што чуюць слова, і прыймаюць, і прыносяць плод: адзін — трыццаць, іншы — шэсьцьдзясят, а іншы — сто».
21 І сказаў ім: «Ці на тое прыносіцца сьвечка, каб паставіць яе пад пасудзіну або пад ложак? Ці не на тое, каб была пастаўлена на сьвечніку?
22 Бо няма нічога тайнага, каб не выявілася, і няма нічога схаванага, каб не сталася яўным.
23 Калі хто мае вушы, каб слухаць, няхай слухае».
24 І сказаў ім: «Глядзіце, што слухаеце! Якою меркаю мерыце, такою вам будзе адмерана і будзе дададзена вам, якія слухаеце.
25 Бо хто мае, таму будзе дадзена, а хто ня мае, дык і тое, што мае, будзе забрана ў яго».

26 І сказаў: «Гэтак ёсьць Валадарства Божае, як быццам чалавек кідае насеньне ў зямлю.
27 І ці ён сьпіць, ці ўстае ноччу і днём, а насеньне ўзыходзіць і расьце, і ён ня ведае, як.
28 Бо зямля сама сабою родзіць спачатку рунь, потым колас, потым поўнае зерне ў коласе.
29 Калі ж плод сасьпее, адразу пасылае серп, бо надыйшло жніво».
30 І сказаў: «Да чаго падобнае Валадарства Божае? Або ў якой прыповесьці выявім яго?
31 Як гарчычнае зерне, якое, калі сеецца ў зямлю, ёсьць меншым за ўсе насеньні на зямлі;
32 а калі пасеянае, узыходзіць і робіцца большым за ўсе расьліны, і пускае галіны вялікія, так што птушкі нябесныя могуць хавацца ў ценю яго».
33 І многімі падобнымі прыповесьцямі гаварыў ім слова, колькі маглі яны слухаць,
34 і без прыповесьці не гаварыў ім, а вучням асобна тлумачыў усё.
35 І ў той самы дзень, калі надыйшоў вечар, кажа ім: «Пераплывем на другі бок».
36 І яны, пакінуўшы натоўп, бяруць Яго, бо Ён быў у чаўне, і іншыя чаўны былі з Ім.
37 І сталася вялікая бура, і хвалі білі ў човен, так што ён ужо напаўняўся [вадою].
38 А Ён спаў на карне на падушцы. І будзяць Яго, і кажуць Яму: «Настаўнік! Ці ж Цябе ня рупіць, што мы гінем?»
39 І Ён, падняўшыся, забараніў ветру і сказаў мору: «Замаўчы, суцішся!» І сьціх вецер, і сталася вялікая ціша.
40 І кажа ім: «Чаму вы так палахлівыя? Ці ж ня маеце веры?»
41 І яны спалохаліся страхам вялікім, і гаварылі адзін аднаму: «Хто ж Ён, што вецер і мора слухаюцца Яго?»

Мк 5

1 І прыйшлі на другі бок мора ў край Гадарэнскі.
2 І калі выйшаў Ён з чаўна, адразу пераняў Яго чалавек з магілаў, [апанаваны] нячыстым духам,
3 які меў жытло ў магілах, і ніхто ня мог яго зьвязаць ланцугамі.
4 Бо шмат разоў зьвязвалі яго кайданамі і ланцугамі, і ён рваў ланцугі і разьбіваў кайданы, і ніхто ня мог утаймаваць яго.
5 І ён заўсёды днём і ноччу ў магілах і ў гарах крычаў і біў сябе камянямі.
6 І, здалёк убачыўшы Ісуса, прыбег, і пакланіўся Яму,
7 і, закрычаўшы моцным голасам, сказаў: «Што мне і Табе, Ісус, Сын Бога Найвышэйшага? Заклінаю Цябе Богам, ня мучай мяне».
8 Бо [Ісус] сказаў яму: «Выйдзі, духу нячысты, з гэтага чалавека».
9 І спытаўся ў яго: «Якое імя тваё?» А ён адказаў, кажучы: «Маё імя — легіён, бо нас многа».
10 І вельмі прасіў Яго, каб не выганяў іх прэч з гэтага краю.
11 А там каля гары пасьвіўся вялікі гурт сьвіньняў.
12 І прасілі Яго ўсе дэманы, кажучы: «Пашлі нас у сьвіньняў, каб мы ў іх увайшлі».
13 І Ісус адразу дазволіў ім. І, выйшаўшы, духі нячыстыя ўвайшлі ў сьвіньняў, і рынуўся гурт са стромы ў мора, а было іх каля дзьвюх тысячаў, і патанулі ў моры.
14 А тыя, што пасьвілі сьвіньняў, уцяклі і абвясьцілі ў горадзе і вёсках, і [людзі] выйшлі паглядзець, што сталася.
15 І прыходзяць да Ісуса, і бачаць, што апанаваны дэманамі, у якім быў легіён, сядзіць адзеты і пры здаровым розуме, і спалохаліся.
16 І тыя, што бачылі, расказалі ім, што сталася з апанаваным дэманам, і пра сьвіньняў.
17 І пачалі прасіць Яго, каб адыйшоў ад межаў іхніх.
18 І калі Ён увайшоў у човен, той, што быў апанаваны дэманам, прасіў Яго, каб быць з Ім.
19 Ісус жа не дазволіў яму, але гаворыць: «Ідзі ў дом твой да сваіх, і раскажы ім, што Госпад учыніў табе і зьлітаваўся над табою».
20 І ён пайшоў, і пачаў абвяшчаць у Дэкапалі, што ўчыніў яму Ісус, і ўсе дзівіліся.
21 І калі Ісус зноў пераправіўся ў чаўне на другі бок, зыйшлося да Яго мноства людзей, і Ён быў каля мора.

22 І вось прыходзіць адзін з начальнікаў сынагогі, на імя Яір, і, убачыўшы Яго, падае да ног
Ягоных,
23 і вельмі просіць Яго, кажучы: «Дачка мая канае, прыйдзі, ускладзі рукі на яе, каб была
выратаваная і жыла».
24 І Ён пайшоў з ім. І ішоў за Ім вялізарны натоўп, і ціснулі Яго.
25 І нейкая жанчына, якая [была] хворая на цячэньне крыві дванаццаць гадоў,
26 і шмат нацярпелася ад шматлікіх лекараў, і выдаткавала ўсё, што мела, і не атрымала
аніякай карысьці, але яшчэ горш пачувалася,
27 пачуўшы пра Ісуса, падыйшла ў натоўпе ззаду і дакранулася да шаты Ягонае,
28 бо казала: «Калі толькі дакрануся шаты Ягонае, буду выратаваная».
29 І адразу высахла ў яе крывацеча, і яна адчула ў целе, што паздаравела ад немачы.
30 І адразу Ісус, адчуўшы ў Сабе, што моц выйшла з Яго, павярнуўся да натоўпу і сказаў: «Хто
дакрануўся шаты Маёй?»
31 І сказалі Яму вучні Ягоныя: «Бачыш натоўп, які цісьне Цябе, і кажаш: “Хто дакрануўся да
Мяне?”»
32 Але Ён паглядзеў кругом, каб убачыць тую, што зрабіла гэта.
33 А жанчына, спалохаўшыся і дрыжучы, ведаючы, што з ёю сталася, падыйшла і ўпала перад
Ім, і сказала Яму ўсю праўду.
34 Ён жа сказаў ёй: «Дачка! Вера твая збавіла цябе. Ідзі ў супакоі і будзь здаровая ад немачы
тваёй».
35 Яшчэ Ён гаварыў, прыходзяць ад начальніка сынагогі людзі і кажуць: «Дачка твая памерла,
нашто яшчэ турбуеш Настаўніка?»
36 Ісус жа, пачуўшы сказанае слова, кажа да начальніка сынагогі: «Ня бойся, толькі вер».
37 І не дазволіў нікому ісьці за Ім, акрамя Пятра, Якуба і Яна, брата Якуба.
38 І прыходзіць у дом начальніка сынагогі, і бачыць замяшаньне, плач і лямант вялікі.
39 І, увайшоўшы, гаворыць ім: «Чаму вы ўзрушаныя і плачаце? Дзіцятка не памерла, але
сьпіць».
40 І сьмяяліся з Яго. Ісус жа, адправіўшы ўсіх, бярэ бацьку і маці дзіцяці ды тых, што з Ім былі,
і ўваходзіць туды, дзе ляжала дзіцятка.
41 І, узяўшы руку дзіцяці, гаворыць ёй: «Таліта кумі», што значыць: «Дзяўчынка, табе кажу,
устань!»
42 І адразу ўстала дзяўчынка, і хадзіла, а мела яна дванаццаць гадоў. І [ўсе] дзівіліся з
захапленьнем вялікім.
43 І перасьцерагаў іх, каб ніхто пра гэта ня ведаў, і сказаў, каб далі ёй есьці.

Мк 6

1 І выйшаў адтуль, і прыйшоў у бацькаўшчыну Сваю, і вучні Ягоныя ідуць за Ім.
2 І калі сталася субота, пачаў вучыць у сынагозе. І многія, слухаючы, дзівіліся і казалі: «Адкуль
у Яго гэтае? І што за мудрасьць дадзеная Яму, што нават цуды гэткія стаюцца праз рукі Яго?
3 Ці ж гэта не цясьляр, сын Марыі, брат Якуба, Ёсіі, Юды і Сымона? Ці ж ня сёстры Ягоныя тут
сярод нас?» І горшыліся праз Яго.
4 А Ісус сказаў ім: «Няма прарока без пашаны, хіба толькі ў бацькаўшчыне сваёй і сярод сваякоў
сваіх, і ў доме сваім».
5 І ня мог там учыніць ніводнага цуду, толькі некалькіх нямоглых, усклаўшы рукі на іх,
аздаравіў.
6 І зьдзіўляўся з недаверства іхняга. І абыходзіў навакольныя мястэчкі, навучаючы.
7 І паклікаў Дванаццаць, і пачаў пасылаць іх па двое, і даў ім уладу над нячыстымі духамі.
8 І загадаў ім, каб ня бралі нічога ў дарогу, акрамя аднаго кія: ані торбы, ані хлеба, ані медзі ў
поясе,
9 але ў сандалы абувацца і не апранацца ў дзьве вопраткі.
10 І сказаў ім: «Дзе толькі ўвойдзеце ў дом, там заставайцеся, пакуль ня пойдзеце адтуль.

11 І калі хто ня прыйме вас і ня будзе вас слухаць, выходзячы адтуль, абтрасіце пыл з вашых
ног на сьведчаньне ім. Сапраўды кажу вам, лягчэй будзе Садому і Гаморы ў дзень суду, чым
гораду гэтаму».
12 І яны, пайшоўшы, абвяшчалі, каб навярталіся,
13 і мноства дэманаў выганялі, і многіх нямоглых мазалі алеем і аздараўлялі.
14 І пачуў валадар Ірад [пра Яго], бо імя Ягонае сталася вядомым, і сказаў: «Гэта Ян
Хрысьціцель уваскрос з мёртвых, і таму цуды дзеюцца праз Яго».
15 Іншыя казалі: «Гэта Ільля», а іншыя казалі: «Гэта прарок, або як адзін з прарокаў».
16 Пачуўшы гэта, Ірад сказаў: «Гэта Ян, якому я сьцяў галаву. Ён уваскрос з мёртвых».
17 Бо Ірад сам паслаў і ўзяў Яна, і ўвязьніў яго ў вязьніцы дзеля Іpадыяды, жонкі Філіпа, брата
свайго, якую ён узяў за жонку.
18 Бо Ян гаварыў Іраду: «Нельга табе мець жонку брата твайго».
19 А сама Іpадыяда злавала на [Яна] і хацела яго зьнішчыць, але не магла,
20 бо Ірад баяўся Яна, ведаючы, што ён чалавек праведны і сьвяты, і сьцярог яго, і шмат што
рабіў, слухаючыся яго, і ахвотна яго слухаў.
21 І як надарыўся зручны дзень, калі Ірад з нагоды народзін сваіх справіў вячэру для магнатаў
сваіх, тысячнікаў і начальнікаў Галілейскіх,
22 дачка Іpадыяды ўвайшла і танчыла, і спадабалася Іраду і тым, што з ім узьлягалі. І сказаў
валадар дзяўчыне: «Прасі ў мяне, што хочаш, і я дам табе».
23 І прысягнуў ёй: «Што папросіш у мяне, дам табе, хоць бы нават палову валадарства майго».
24 Яна, выйшаўшы, спыталася ў маці сваёй: «Што мне прасіць?» Тая ж сказала: «Галаву Яна
Хрысьціцеля».
25 І яна, адразу шпарка вярнуўшыся да валадара, прасіла, кажучы: «Хачу, каб неадкладна даў
ты мне на місе галаву Яна Хрысьціцеля».
26 І валадар, хоць засмуткаваўшы, але дзеля прысягі і тых, што ўзьлягалі, не захацеў ёй
адмовіць.
27 І адразу, паслаўшы ката, валадар загадаў прынесьці галаву яго.
28 Той, пайшоўшы, сьцяў яго ў вязьніцы, і прынёс галаву ягоную на місе, і даў дзяўчыне, а
дзяўчына дала яе маці сваёй.
29 І, пачуўшы [пра гэта], вучні ягоныя прыйшлі і ўзялі цела ягонае, і палажылі яго ў магілу.
30 І сабраліся апосталы да Ісуса, і расказалі Яму ўсё, і што зрабілі, і чаго навучылі.
31 І Ён сказаў ім: «Ідзіце адны ў пустыннае месца, і супачыньце крыху». Бо многа было тых,
што прыходзілі і адыходзілі, і нават паесьці ня мелі часу.
32 І паплылі ў пустыннае месца на чаўне адны.
33 І бачыў натоўп, як яны адплывалі, і многія пазналі іх, і зьбегліся туды пешшу з усіх гарадоў,
і апярэдзілі іх, і зыйшліся да Яго.
34 І, выйшаўшы, Ісус убачыў вялікі натоўп, і зьлітаваўся з іх, бо яны былі як авечкі, што ня
маюць пастуха, і пачаў навучаць іх шмат.
35 І калі мінула шмат часу, вучні Ягоныя, прыйшоўшы да Яго, кажуць: «Месца гэтае пустыннае,
а гадзіна ўжо позьняя.
36 Адпусьці іх, каб, пайшоўшы ў навакольныя вёскі і мястэчкі, купілі сабе хлеба, бо яны ня
маюць, што есьці».
37 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Вы дайце ім есьці». І кажуць Яму: «Няўжо маем пайсьці і
купіць за дзьвесьце дынараў хлеба, і даць ім есьці?»
38 Ён жа гаворыць ім: «Колькі маеце хлябоў? Ідзіце і паглядзіце!» Яны, даведаўшыся, кажуць:
«Пяць, і дзьве рыбы».
39 І загадаў ім пасадзіць усіх грамадамі на зялёнай траве.
40 І паселі шэраг за шэрагам па сто і па пяцьдзясят.
41 І Ён, узяўшы пяць хлябоў і дзьве рыбы, глянуўшы ў неба, дабраславіў і паламаў хлябы, і даў
вучням Сваім, каб яны раздалі ім; і дзьве рыбы разьдзяліў для ўсіх.
42 І елі ўсе, і наеліся.

43 І сабралі кавалкаў дванаццаць поўных кашоў, і рэшткі рыбы.
44 А тых, што елі хлябы, было каля пяці тысячаў мужчынаў.
45 І адразу змусіў вучняў Сваіх увайсьці ў човен і плысьці наперад на другі бок, у Бэтсаіду,
пакуль Ён адпусьціць натоўп.
46 І, адпусьціўшы іх, пайшоў на гару маліцца.
47 І як надыйшоў вечар, човен быў на сярэдзіне мора, а Ён адзін на зямлі.
48 І ўбачыў іх, як мучыліся, плывучы, бо вецер быў супраціўны, і каля чацьвёртай варты ночы
прыходзіць да іх, ідучы па моры, і хацеў абмінуць іх.
49 Яны, убачыўшы Яго, як Ён ішоў па моры, думалі, што гэта здань, і закрычалі.
50 Бо ўсе бачылі Яго і ўстрывожыліся. І Ён адразу прамовіў да іх, і кажа ім: «Будзьце пэўныя,
гэта Я, ня бойцеся!»
51 І ўвайшоў да іх у човен, і вецер сьціх. І яны празьмерна здумеліся ў сабе, і зьдзіўляліся,
52 бо не зразумелі з хлябамі, бо сэрца іхняе было скамянелае.
53 І, пераплыўшы, прыйшлі ў зямлю Генэсарэт, і прысталі да берагу.
54 І калі яны выйшлі з чаўна, адразу пазналі Яго,
55 абеглі ўвесь той край, і пачалі на ложках прыносіць хворых туды, дзе, як чулі, быў Ён.
56 І, калі Ён уваходзіў у якое паселішча, або горад, або вёску, клалі нядужых на плошчах,
і прасілі Яго, каб хоць крыса шаты Яго дакрануцца; і колькі іх дакранулася Яго, былі
аздароўлены.

Мк 7

1 І сабраліся да Яго фарысэі і некаторыя кніжнікі, што прыйшлі з Ерусаліму.
2 І, убачыўшы некаторых з вучняў Ягоных, што елі хлеб нячыстымі, гэта значыць, нямытымі
рукамі, вінавацілі іх.
3 Бо самі фарысэі і ўсе Юдэі не ядуць, не абмыўшы чыста рук, трымаючыся традыцыяў
старэйшых.
4 І пасьля рынку, пакуль не абмыюцца, не ядуць; і ёсьць шмат іншага, чаго яны
прытрымліваюцца: абмываньня келіхаў і конавак, мядніцаў і сталоў.
5 Пасьля пытаюцца ў Яго фарысэі і кніжнікі: «Чаму вучні Твае ня ходзяць паводле традыцыяў
старэйшых, але нячыстымі рукамі ядуць хлеб?»
6 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Добра пра вас, крывадушнікаў, прарочыў Ісая, як напісана:
“Народ гэты губамі шануе Мяне, а сэрца іхняе трымаецца далёка ад Мяне.
7 Але марна пакланяюцца Мне, навучаючы вучэньням і пастановам чалавечым”.
8 Бо вы, пакінуўшы прыказаньне Божае, трымаецеся традыцыі чалавечай, абмываньня
конавак і келіхаў, і шмат іншага, да гэтага падобнага, чыніце».
9 І сказаў ім: «Ці добра, што вы адкідаеце прыказаньне Божае, каб захаваць традыцыю вашую?
10 Бо Майсей сказаў: “Шануй бацьку твайго і маці тваю”, і: “Хто праклінае бацьку або маці,
няхай сьмерцю памрэ”.
11 А вы гаворыце: “Калі скажа чалавек бацьку або маці: ‘Карбан’, гэта значыць, дар [Богу] тое,
чым бы ты ад мяне карыстаўся”,
12 і ўжо дазваляеце яму нічога не рабіць для бацькі свайго або маці сваёй,
13 пазбаўляючы сілы слова Божае праз традыцыю вашую, якую вы перадаяцё, і шмат да гэтага
падобнага чыніце».
14 І, паклікаўшы ўвесь натоўп, гаварыў ім: «Слухайце Мяне ўсе і разумейце.
15 Няма нічога, што звонку чалавека, што ўваходзячы ў яго, можа яго апаганіць, але тое, што з
чалавека выходзіць, апаганьвае яго.
16 Калі хто мае вушы слухаць, няхай слухае».
17 І калі Ён увайшоў у дом ад натоўпу, пыталіся Яго вучні Ягоныя пра прыповесьць.
18 І кажа ім: «Няўжо і вы такія няцямкія? Няўжо не разумееце, што ўсё, што звонку ўваходзіць
у чалавека, ня можа яго апаганіць,
19 бо ўваходзіць ня ў сэрца ягонае, але ў жывот, і выкідаецца прэч, ачышчаючы ўсякую ежу».

20 І сказаў: «Тое, што выходзіць з чалавека, яно апаганьвае яго,
21 бо з нутра, з сэрца чалавечага выходзяць благія думкі, чужалоства, распуснасьць, забойствы,
22 крадзяжы, хцівасьць, зласьлівасьць, подступ, бессаромнасьць, злое вока, блюзьнерствы, пыха, глупота.
23 Уся гэтая ліхота знутры выходзіць і апаганьвае чалавека».
24 І, устаўшы адтуль, Ён адыйшоў у межы Тыру і Сідону. І, увайшоўшы ў дом, хацеў, каб ніхто не даведаўся, але ўтоіцца ня змог.
25 Бо пачула пра Яго жанчына, у якой дачка мела ў сабе нячыстага духа, і, прыйшоўшы, упала да ног Ягоных.
26 А жанчына гэтая была Грэчанка, родам Сірафінікіянка; і прасіла яна Яго, каб выгнаў дэмана з дачкі ейнай.
27 Але Ісус сказаў ёй: «Дазволь перш насыціцца дзецям, бо нядобра ўзяць хлеб у дзяцей і кінуць сабакам».
28 Яна ж адказала і кажа Яму: «Так, Госпадзе, але ж і сабакі пад сталом ядуць крошкі, [што ўпалі] ад дзяцей».
29 І сказаў ёй: «Дзеля такога слова ідзі; дэман выйшаў з дачкі тваёй».
30 І адыйшоўшы ў дом свой, яна знайшла, што дэман выйшаў і дачка ляжыць на ложку.
31 І зноў, выйшаўшы з межаў Тыру і Сідону, пайшоў Ён да мора Галілейскага пасярод межаў Дэкапаля.
32 І прыводзяць да Яго глухога, які з цяжкасьцю гаварыў, і просяць Яго ўскласьці на яго руку.
33 І, узяўшы яго ад натоўпу на бок, уклаў пальцы Свае ў вушы ягоныя, і, плюнуўшы, дакрануўся да языка ягонага.
34 І, глянуўшы ў неба, уздыхнуў, і гаворыць яму: «Эффата», што значыць: «Адчыніся».
35 І адразу адчыніліся вушы ягоныя і разьвязаліся путы языка ягонага, і ён пачаў добра гаварыць.
36 І Ён перасьцерагаў іх, каб нікому не расказвалі, але колькі ні забараняў, яны яшчэ шырэй абвяшчалі.
37 І надзвычай дзівіліся, кажучы: «Усё добра зрабіў, і глухім робіць, каб чулі, і нямым, каб гаварылі».

Мк 8

1 У тыя дні, калі сабраўся вельмі вялікі натоўп і ня мелі што есьці, Ісус, паклікаўшы вучняў Сваіх, кажа ім:
2 «Шкада Мне гэтых людзей, бо ўжо тры дні са Мною, і ня маюць што есьці.
3 І калі іх галоднымі адпушчу ў дамы іхнія, саслабеюць у дарозе, бо некаторыя з іх прыйшлі здалёк».
4 І адказалі Яму вучні Ягоныя: «Адкуль мог бы хто накарміць іх хлебам тут, у пустыні?»
5 І спытаўся ў іх: «Колькі маеце хлябоў?» Яны сказалі: «Сем».
6 І загадаў натоўпу сесьці на зямлю, і, узяўшы сем хлябоў і падзякаваўшы, паламаў, і даў вучням Сваім, каб раздалі; і яны раздалі натоўпу.
7 І мелі яны некалькі рыбаў. І, дабраславіўшы іх, сказаў раздаць і тыя.
8 І елі, і наеліся, і сабралі кавалкаў, што засталіся, сем кашоў.
9 А тых, што елі, было каля чатырох тысячаў; і адпусьціў іх.
10 І адразу, увайшоўшы з вучнямі Сваімі ў човен, прыйшоў у межы Дальмануты.
11 І выйшлі фарысэі, і пачалі з Ім спрачацца, дамагаючыся ў Яго знаку з неба, спакушаючы Яго.
12 І Ён, уздыхнуўшы ў духу, гаворыць: «Чаму гэтае пакаленьне патрабуе знаку? Сапраўды кажу вам, знак ня будзе дадзены пакаленьню гэтаму».
13 І, пакінуўшы іх, увайшоў у човен і выправіўся на другі бок.
14 І забыліся ўзяць хлеб, і нічога ня мелі з сабою ў чаўне, апрача аднаго хлеба.
15 І Ён перасьцерагаў іх, кажучы: «Глядзіце, сьцеражыцеся кісьлі фарысэйскай і кісьлі Іродавай».

16 І яны разважалі між сабой, кажучы: «Гэта таму, што хлеба ня маем».
17 І, зразумеўшы, Ісус кажа ім: «Чаму разважаеце, што ня маеце хлеба? Ці яшчэ ня цяміце і не
разумееце? Ці яшчэ скамянелае маеце сэрца вашае?
18 Маючы вочы, ня бачыце? І маючы вушы, ня чуеце? І ня памятаеце?
19 Калі Я пяць хлябоў падзяліў між пяці тысячаў, колькі поўных кашоў кавалкаў вы
назьбіралі?» Кажуць Яму: «Дванаццаць».
20 «А калі сем між чатырох тысячаў, колькі поўных кашоў кавалкаў назьбіралі?» Яны сказалі:
«Сем».
21 І сказаў ім: «Як жа не разумееце?»
22 І прыходзіць у Бэтсаіду, і прыводзяць да Яго сьляпога, і просяць Яго, каб дакрануўся да яго.
23 І, узяўшы сьляпога за руку, вывеў яго за мястэчка і, плюнуўшы на вочы ягоныя і ўсклаўшы
на яго рукі, спытаўся ў яго, ці што бачыць.
24 І той, зірнуўшы, сказаў: «Бачу людзей, што як дрэвы ходзяць».
25 Потым зноў усклаў рукі на вочы яго і зрабіў, каб бачыў. І той зрабіўся здаровым, і ясна мог
усё бачыць.
26 І паслаў яго ў дом ягоны, кажучы: «Не заходзь у мястэчка і не кажы нікому ў мястэчку».
27 І пайшоў Ісус з вучнямі Сваімі ў паселішчы Цэзарэі Філіпавай. І ў дарозе пытаўся ў вучняў
Сваіх, кажучы: «Кім называюць Мяне людзі?»
28 Яны адказалі: «Янам Хрысьціцелем, а іншыя — Ільлём, а іншыя — адным з прарокаў».
29 І Ён кажа ім: «А вы кім называеце Мяне?» І адказваючы, Пётар кажа Яму: «Ты — Хрыстос!»
30 І забараніў ім, каб нікому не гаварылі пра Яго.
31 І пачаў іх навучаць, што трэба, каб Сын Чалавечы шмат перацярпеў, і быў адкінуты
старшынямі, і першасьвятарамі, і кніжнікамі, і быў забіты, і праз тры дні ўваскрос.
32 І гаварыў пра гэта адкрыта. І Пётар, адклікаўшы Яго, пачаў забараняць Яму.
33 Ён жа, павярнуўшыся і глянуўшы на вучняў Сваіх, забараніў Пятру, кажучы: «Адыйдзі ад
Мяне, шатан, бо думаеш не пра тое, што Божае, але што чалавечае».
34 І, паклікаўшы натоўп разам з вучнямі Сваімі, сказаў ім: «Калі хто хоча ісьці за Мною, няхай
адрачэцца самога сябе, і возьме крыж свой, і ідзе за Мною.
35 Бо хто хоча выратаваць душу сваю, той загубіць яе; а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне і
дзеля Эвангельля, той збавіць яе.
36 Бо што за карысьць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь сьвет, а душы сваёй пашкодзіць?
37 Або што дасьць чалавек у выкуп за душу сваю?
38 Бо хто пасаромеецца Мяне і словаў Маіх у гэтым пакаленьні, чужаложным і грэшным, таго
і Сын Чалавечы пасаромеецца, калі прыйдзе ў славе Айца Свайго з анёламі сьвятымі».

Мк 9

1 І сказаў ім: «Сапраўды кажу вам, што ёсьць некаторыя з тых, што тут стаяць, якія не
пакаштуюць сьмерці, пакуль ня ўбачаць Валадарства Божае, што прыходзіць у моцы».
2 І праз шэсьць дзён бярэ Ісус Пятра, і Якуба, і Яна, і вядзе іх асобна адных на высокую гару. І
перамяніўся перад імі.
3 І адзеньне Яго сталася бліскучым і такім белым, як сьнег, такім, што на зямлі бялільшчык
выбеліць ня зможа.
4 І зьявіўся ім Ільля з Майсеем, і вялі гутарку з Ісусам.
5 І, адказваючы, Пётар гаворыць Ісусу: «Раббі, добра нам тут быць, зробім тры намёты: Табе
адзін, і Майсею адзін, і Ільлі адзін».
6 Бо ня ведаў, што гаворыць, бо яны былі напалоханыя.
7 І сталася воблака, ахінуўшае іх, і голас выйшаў з воблака, які казаў: «Гэта Сын Мой улюбёны,
Яго слухайце!»
8 І раптам, разгледзеўшыся наўкола, нікога больш ня ўбачылі, апрача аднаго Ісуса.
9 Калі ж яны зыходзілі з гары, Ён загадаў ім, каб нікому не расказвалі пра тое, што бачылі,
пакуль Сын Чалавечы не ўваскрэсьне з мёртвых.

10 І яны прынялі гэтае слова, пытаючыся адзін аднаго: «Што гэта значыць: уваскрэснуць з
мёртвых?».
11 І спыталіся ў Яго, кажучы: «Чаму кніжнікі кажуць, што спачатку павінен прыйсьці Ільля?»
12 А Ён, адказваючы, сказаў ім: «Ільля, прыйшоўшы спачатку, направіць усё; і як напісана пра
Сына Чалавечага, што шмат перацерпіць і будзе лічыцца за нішто.
13 Але кажу вам: і Ільля прыйшоў, і ўчынілі з ім, што хацелі, як напісана пра яго».
14 І, прыйшоўшы да вучняў, убачыў вакол іх вялікі натоўп і кніжнікаў, што спрачаліся з імі.
15 І адразу ўвесь натоўп, убачыўшы Яго, здумеўся, і, падбягаючы, вітаў Яго.
16 І Ён спытаўся ў кніжнікаў: «Пра што спрачаецеся з імі?»
17 І, адказваючы, адзін з натоўпу сказаў: «Настаўнік, я прывёў да Цябе сына майго, які мае
духа нямога.
18 І ён, дзе схопіць яго, кідае яго на зямлю, і ён пеніцца, і скрыгоча зубамі ды пруцянее. І я
казаў вучням Тваім, каб выгналі яго, і яны ня здолелі».
19 Ён жа, адказваючы яму, гаворыць: «О, пакаленьне бязьвернае! Як доўга буду з вамі? Як
доўга буду цярпець вас? Прывядзіце яго да Мяне».
20 І прывялі яго да Яго. І, убачыўшы Яго, адразу дух тузануў яго, і ён упаў на зямлю і качаўся,
выпускаючы пену.
21 І спытаўся Ён у бацькі ягонага: «Як даўно гэта зрабілася з ім?» А ён сказаў: «Ад дзяцінства;
22 і шмат разоў кідаў яго ў агонь і ў ваду, каб яго загубіць. Але, калі што можаш, дапамажы
нам, зьлітаваўшыся над намі».
23 Ісус жа сказаў яму: «Калі можаш верыць, усё магчыма таму, хто верыць».
24 І адразу, загаласіўшы, бацька хлопца сказаў праз сьлёзы: «Веру, Госпадзе! Дапамажы майму
недаверству».
25 Ісус, убачыўшы, што зьбіраецца натоўп, забараніў духу нячыстаму, кажучы яму: «Духу
нямы і глухі! Я загадваю табе: выйдзі з яго і больш не ўваходзь у яго!»
26 І той, закрычаўшы і моцна тузануўшы яго, выйшаў; і ён зрабіўся, як мёртвы, так што многія
гаварылі, што ён памёр.
27 Але Ісус, узяўшы яго за руку, падняў яго, і ён устаў.
28 І калі ўвайшоў у дом, вучні Ягоныя ўжо адны пыталіся ў Яго: «Чаму мы не маглі выгнаць
яго?»
29 І Ён сказаў ім: «Гэты род ніяк ня можа выйсьці, адно толькі праз малітву і пост».
30 І, выйшаўшы адтуль, праходзілі праз Галілею, і Ён не хацеў, каб хто даведаўся.
31 Бо навучаў вучняў Сваіх і гаварыў ім, што Сын Чалавечы будзе выдадзены ў рукі людзей і
заб'юць Яго, але, забіты, праз тры дні ўваскрэсьне.
32 Але яны слова гэтага не разумелі, а спытацца ў Яго баяліся.
33 І прыйшоў у Капэрнаум, і калі яны былі ў доме, спытаўся ў іх: «Пра што ў дарозе вы між
сабою разважалі?»
34 Але яны маўчалі, бо дарогаю вялі гутарку між сабою, хто большы.
35 І, сеўшы, паклікаў Дванаццаць, і кажа ім: «Калі хто хоча быць першым, няхай будзе з усіх
апошнім і служыцелем для ўсіх».
36 І, узяўшы дзіця, паставіў яго пасярод іх, і, прытуліўшы яго, сказаў ім:
37 «Хто прыйме адно з такіх дзяцей у імя Маё, той Мяне прыймае, а хто Мяне прыйме, той не
Мяне прыймае, але Таго, Хто Мяне паслаў».
38 І адказаў Яму Ян, кажучы: «Настаўнік, мы бачылі чалавека, які ў імя Тваё выганяе дэманаў,
але ня ходзіць за намі, і мы забаранілі яму, бо ён ня ходзіць за намі».
39 А Ісус сказаў: «Не забараняйце яму, бо няма нікога, хто, учыніўшы цуд у імя Маё, мог бы
хутка праклінаць Мяне.
40 Бо хто ня супраць вас, той за вас.
41 Бо хто напоіць вас кубкам вады ў імя Маё, таму што вы — Хрыстовыя, сапраўды кажу вам,
ня страціць нагароды сваёй.

42 А хто згоршыць аднаго з малых гэтых, якія вераць у Мяне, такому лепш было б, каб
прычапілі млынавы камень на шыю ягоную і кінулі яго ў мора.
43 І калі рука твая горшыць цябе, адсячы яе; лепш табе калекаю ўвайсьці ў жыцьцё, чым, маючы
абедзьве рукі, ісьці ў геенну, у агонь нязгасны,
44 дзе чарвяк іх не памірае і агонь не згасае.
45 І калі нага твая горшыць цябе, адсячы яе; лепш табе кульгавым увайсьці ў жыцьцё, чым,
маючы абедзьве нагі, быць укінутым у геенну, у агонь нязгасны,
46 дзе чарвяк іх не памірае і агонь не згасае.
47 І калі вока тваё горшыць цябе, выдзяры яго; лепш табе з адным вокам увайсьці ў Валадарства
Божае, чым, маючы двое вачэй, быць укінутым у геенну вогненную,
48 дзе чарвяк іх не памірае і агонь не згасае.
49 Бо кожны агнём будзе пасолены, і ўсякая ахвяра сольлю будзе пасоленая.
50 Соль добрая, але калі соль станецца несалёнай, чым яе прыправіце? Мейце ў сабе соль і
супакой мейце між сабою».

Мк 10

1 Устаўшы адтуль, прыходзіць у межы Юдэі за Ярданам. І зноў зьбіраецца вакол Яго натоўп, і
Ён, як меў звычай, зноў навучаў іх.
2 І, падыйшоўшы, фарысэі спыталіся ў Яго, спакушаючы Яго: «Ці можна мужу кінуць жонку?»
3 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «А што загадаў вам Майсей?»
4 Яны ж сказалі: «Майсей дазволіў напісаць разводны ліст і пакінуць яе».
5 І, адказваючы, сказаў ім Ісус: «Дзеля жорсткасьці сэрца вашага напісаў ён вам гэткае
прыказаньне.
6 Але на пачатку стварэньня мужчынай і жанчынай стварыў іх Бог.
7 Дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй,
8 і будуць двое адным целам; дык іх ужо ня двое, але адно цела.
9 Што вось Бог злучыў, чалавек няхай не разлучае».
10 І ў доме вучні Ягоныя зноў пра тое самае пыталіся ў Яго.
11 І кажа ім: «Хто пакіне жонку сваю і ажэніцца з іншай, той чужаложыць з ёю.
12 І калі жонка пакіне мужа свайго і пойдзе за іншага — чужаложыць».
13 І прыносілі дзетак да Яго, каб Ён дакрануўся да іх; вучні ж забаранялі тым, што прыносілі.
14 Бачачы гэта, Ісус абурыўся і сказаў ім: «Дазвольце дзецям прыходзіць да Мяне і не
забараняйце ім, бо гэтакіх ёсьць Валадарства Божае.
15 Сапраўды кажу вам: хто ня прыйме Валадарства Божага як дзіця, ня ўвойдзе ў яго».
16 І, прытуліўшы іх і ўсклаўшы на іх рукі, дабраславіў іх.
17 І калі выходзіў у дарогу, нехта, падбегшы і ўпаўшы перад Ім на калені, спытаўся ў Яго:
«Настаўнік добры! Што мне рабіць, каб успадкаеміць жыцьцё вечнае?»
18 Ісус жа сказаў яму: «Чаму Мяне называеш добрым? Ніхто ня добры, толькі адзін Бог.
19 Ведаеш прыказаньні: “Не чужалож”, “Не забівай”, “Не крадзі”, “Ня сьведчы фальшыва”, “Не
рабі крыўды”, “Шануй бацьку твайго і маці”».
20 А ён, адказваючы, сказаў Яму: «Настаўнік, усё гэта я захаваў ад юнацтва майго».
21 Ісус жа, паглядзеўшы на яго, узьлюбіў яго і сказаў яму: «Аднаго табе не хапае: ідзі, прадай
усё, што маеш, і раздай убогім, і будзеш мець скарб у небе, і прыходзь, ідзі за Мною, узяўшы
крыж».
22 Той жа, спахмурнелы ад гэтага слова, адыйшоўся сумны, бо меў вялікую маёмасьць.
23 І Ісус, паглядзеўшы вакол, кажа вучням Сваім: «Як цяжка тым, што маюць грошы, увайсьці
ў Валадарства Божае».
24 Вучні аслупянелі дзеля словаў Ягоных. Але Ісус зноў, адказваючы, кажа ім: «Дзеці, як цяжка
ўвайсьці ў Валадарства Божае тым, хто ўскладае надзею на багацьце.
25 Лягчэй вярблюду прайсьці праз вушка іголкі, чым багатаму ўвайсьці ў Валадарства Божае».

26 А яны яшчэ больш дзівіліся, гаворачы між сабою: «Хто ж тады можа быць збаўлены?»
27 Ісус, паглядзеўшы на іх, гаворыць: «У людзей гэта немагчыма, але ня ў Бога, бо ў Бога ўсё
магчыма».
28 І Пётар пачаў гаварыць Яму: «Вось жа мы пакінулі ўсё і пайшлі за Табою».
29 Адказваючы, Ісус сказаў: «Сапраўды кажу вам: Няма нікога, хто б пакінуў дом, або
братоў, або сёстраў, або бацьку, або маці, або жонку, або дзяцей, або палі дзеля Мяне і дзеля
Эвангельля,
30 і не атрымаў бы цяпер, у гэты час, сярод перасьледаваньняў, у сто разоў больш дамоў, і
братоў, і сёстраў, і маці, і дзяцей, і палёў, а ў будучым веку — жыцьцё вечнае.
31 І многія першыя будуць апошнімі, і апошнія — першымі».
32 Калі яны былі ў дарозе, узыходзячы ў Ерусалім, Ісус ішоў наперадзе іх, а яны жахаліся і,
ідучы за Ім, былі ў страху. І, узяўшы зноў Дванаццаць, пачаў гаварыць ім пра тое, што з Ім мае
здарыцца:
33 «Вось, мы ўзыходзім у Ерусалім; і Сын Чалавечы будзе выдадзены першасьвятарам і
кніжнікам, і асудзяць Яго на сьмерць, і выдадуць Яго паганам,
34 і будуць зьдзекавацца з Яго, будуць бічаваць Яго і пляваць на Яго, і заб'юць Яго, і на трэці
дзень Ён уваскрэсьне».
35 І падыйшлі да Яго Якуб і Ян, сыны Заўдыя, кажучы: «Настаўнік, мы хочам, каб Ты зрабіў
нам, пра што будзем прасіць».
36 Ён жа сказаў ім: «Што хочаце, каб Я зрабіў вам?»
37 Яны ж сказалі Яму: «Дай нам, каб нам сесьці аднаму праваруч Цябе, а другому — леваруч
Цябе ў славе Тваёй».
38 Ісус жа сказаў ім: «Ня ведаеце, пра што просіце. Ці ж можаце піць келіх, які Я п'ю, або
хрысьціцца хрышчэньнем, якім Я хрышчуся?»
39 Яны сказалі Яму: «Можам». Ісус жа сказаў ім: «Келіх, які Я п'ю, будзеце піць, і
хрышчэньнем, якім Я хрышчуся, будзеце ахрышчаны.
40 Але сесьці праваруч Мяне або леваруч Мяне не Мая [справа] даваць, але каму
падрыхтавана».
41 І, пачуўшы, дзесяць пачалі абурацца на Якуба і Яна.
42 Ісус жа, паклікаўшы іх, гаворыць ім: «Вы ведаеце, што тыя, якія лічацца князямі народаў,
пануюць над імі, і магнаты іхнія маюць уладу над імі.
43 У вас няхай будзе ня гэтак, але хто хоча стацца між вамі большым, няхай будзе служыцелем
вашым.
44 І хто хоча ў вас стацца першым, няхай будзе слугою ўсіх.
45 Бо і Сын Чалавечы не прыйшоў, каб Яму служылі, але каб паслужыць і аддаць душу Сваю на
адкупленьне многіх».
46 І прыходзяць у Ерыхон. І калі Ён выходзіў з Ерыхону з вучнямі Сваімі і вялікім натоўпам,
сьляпы Бартымей, сын Тымея, сядзеў пры дарозе, жабруючы.
47 І, пачуўшы, што гэта Ісус з Назарэту, пачаў крычаць і казаць: «Ісусе, Сыне Давідаў, зьлітуйся
нада мною!»
48 І сварыліся многія на яго, каб замаўчаў, але ён тым мацней закрычаў: «Сыне Давідаў,
зьлітуйся нада мною!»
49 І, спыніўшыся, Ісус сказаў паклікаць яго. І клічуць сьляпога, гаворачы яму: «Будзь пэўны,
уставай, кліча цябе».
50 Ён, пакінуўшы адзеньне сваё, устаў і прыйшоў да Ісуса.
51 І, адказваючы, гаворыць яму Ісус: «Што хочаш, каб Я табе ўчыніў?» Сьляпы сказаў Яму:
«Раббоні, каб мне бачыць».
52 Ісус жа сказаў яму: «Ідзі, вера твая збавіла цябе». І адразу ён стаў бачыць, і пайшоў за Ісусам
па дарозе.

Мк 11

1 І калі наблізіліся да Ерусаліму, да Бэтфагі і Бэтаніі на гары Аліўнай, Ён пасылае двух вучняў

Сваіх
2 і гаворыць ім: «Ідзіце ў мястэчка, што перад вамі, і адразу, уваходзячы ў яго, знойдзеце
асьляня прывязанае, на якога яшчэ ніхто з людзей не сядаў; адвязаўшы яго, прывядзіце.
3 І калі хто скажа вам: “Што вы гэта робіце?”, скажыце, што Госпад яго патрабуе, і адразу пашле
яго сюды».
4 Яны пайшлі і знайшлі асьляня пры дзьвярах звонку на вуліцы, і адвязалі яго.
5 І некаторыя, што там стаялі, гаварылі ім: «Што вы робіце, адвязваючы асьляня?»
6 Яны ж сказалі ім, як загадаў Ісус, і пусьцілі іх.
7 І прывялі асьляня да Ісуса, і ўсклалі на яго адзеньне сваё; і Ён сеў на яго.
8 І многія пасьцілалі на дарозе адзеньне сваё, а іншыя рэзалі галіны з дрэваў і пасьцілалі на
дарозе.
9 І тыя, што ішлі наперадзе, і тыя, што ішлі за Ім, крычалі, кажучы: «Гасанна! Дабраслаўлёны
Той, Хто прыходзіць у імя Госпада!
10 Дабраслаўлёнае валадарства бацькі нашага Давіда, якое прыходзіць у імя Госпада! Гасанна
на вышынях!»
11 І ўвайшоў Ісус у Ерусалім і ў сьвятыню; і, агледзеўшы ўсё, бо гадзіна ўжо была вечаровая,
выйшаў у Бэтанію з Дванаццацьцю.
12 І назаўтра, калі ішлі яны з Бэтаніі, Ён адчуў голад.
13 І, убачыўшы здалёк фігавае дрэва, пакрытае лісьцем, падыйшоў, ці ня знойдзе што на ім;
але, падыйшоўшы да яго, нічога не знайшоў, акрамя лістоты, бо не была пара на фігі.
14 І, адказваючы, Ісус сказаў да яго: «Няхай ніхто ўжо да веку ня есьць з цябе плоду». І чулі
гэта вучні Ягоныя.
15 І прыходзяць у Ерусалім. І Ісус, увайшоўшы ў сьвятыню, пачаў выганяць тых, што продалі і
куплялі ў сьвятыні, і сталы мяняльнікаў і лаўкі прадаўцоў галубоў перавярнуў,
16 і не дазваляў, каб хто насіў хоць якую рэч праз сьвятыню.
17 І навучаў, кажучы ім: «Ці ж не напісана: “Дом Мой домам малітвы будзе названы для ўсіх
народаў”? А вы зрабілі яго пячорай разбойнікаў».
18 І пачулі гэта першасьвятары і кніжнікі, і шукалі, як Яго загубіць, бо баяліся Яго, бо ўвесь
натоўп захапляўся вучэньнем Ягоным.
19 І калі зьвечарэла, Ён выйшаў з гораду.
20 І раніцаю, праходзячы міма, убачылі фігавае дрэва, ссохлае ад кораня.
21 І, узгадаўшы, Пётар кажа Яму: «Раббі, вось, фігавае дрэва, якое Ты пракляў, засохла».
22 І, адказваючы, Ісус гаворыць ім: «Мейце веру Божую!
23 Бо сапраўды кажу вам: калі хто скажа гэтай гары: “Будзь узятая і кінутая ў мора”, і ня будзе
сумнявацца ў сэрцы сваім, але будзе верыць, што станецца так, як гаворыць, — будзе яму, што
б ні сказаў.
24 Дзеля гэтага кажу вам: Усё, пра што ў малітве будзеце прасіць, верце, што атрымаеце, і
будзе вам.
25 І калі стаіцё ў малітве, даруйце, калі што маеце супраць каго, каб і Айцец ваш, Які ў небе,
дараваў вам грахі вашыя.
26 Калі ж вы не даруеце, дык і Айцец ваш, Які ў небе, не даруе вам грахоў вашых».
27 І зноў прыходзяць у Ерусалім. І калі Ён хадзіў у сьвятыні, падыйшлі да Яго першасьвятары,
кніжнікі і старшыні,
28 і гаварылі Яму: «Якою ўладаю Ты гэта робіш? І хто даў Табе ўладу рабіць гэтае?»
29 А Ісус, адказваючы, сказаў ім: «Спытаюся і Я ў вас адно слова, і вы адкажыце Мне, і Я вам
скажу, якою ўладай Я раблю гэта.
30 Хрышчэньне Яна з неба было ці ад людзей? Адкажыце Мне».
31 І яны разважалі між сабой, кажучы: «Калі скажам: “З неба”, — Ён скажа: “Дык чаму тады не
паверылі яму?”»
32 А сказаць: «Ад людзей», баяліся натоўпу, бо ўсе мелі Яна за праўдзівага прарока.

33 І, адказваючы, гавораць Ісусу: «Ня ведаем». І Ісус, адказваючы, гаворыць ім: «І Я вам не
скажу, якою ўладаю Я гэта раблю».

Мк 12

1 І пачаў гаварыць да іх у прыповесьцях: «Адзін чалавек пасадзіў вінаграднік, і абгарадзіў яго
плотам, і выкапаў вінатоку, і збудаваў вежу, і здаў яго вінаградарам, і выехаў.
2 І паслаў у свой час да вінаградараў слугу, каб узяў у вінаградараў пладоў з вінаградніку.
3 Яны ж, схапіўшы яго, зьбілі і выправілі ні з чым.
4 І зноў паслаў да іх іншага слугу, і яму камянямі разьбілі галаву, і выправілі, зьняважыўшы.
5 І зноў паслаў іншага, і яго забілі, і многіх іншых адных білі, другіх забівалі.
6 Дык маючы яшчэ адзінага сына, улюбёнага свайго, урэшце паслаў і яго да іх, кажучы:
“Пасаромеюцца сына майго”.
7 Але вінаградары сказалі адзін аднаму: “Гэта спадкаемца! Пойдзем, заб’ем яго, і нашаю будзе
спадчына”.
8 І, схапіўшы яго, забілі, і выкінулі з вінаградніку.
9 Дык што зробіць гаспадар вінаградніку? Ён прыйдзе і выгубіць вінаградараў, а вінаграднік
аддасьць іншым.
10 Няўжо вы не чыталі гэтага Пісаньня: “Камень, які адкінулі будаўнікі, стаўся галавой вугла.
11 Ад Госпада гэта сталася, і дзіўна ў вачах нашых”».
12 І шукалі схапіць Яго, але баяліся натоўпу, бо ведалі, што пра іх сказаў гэтую прыповесьць. І,
пакінуўшы Яго, адыйшлі.
13 І пасылаюць да Яго некаторых з фарысэяў і ірадыянаў, каб злавіць Яго на слове.
14 Яны, прыйшоўшы, гавораць Яму: «Настаўнік, мы ведаем, што Ты праўдзівы і не дагаджаеш
нікому, бо не глядзіш на абліччы людзей, але шляху Божаму паводле праўды навучаеш. Ці
належыцца даваць даніну цэзару, ці не? Даваць ці не даваць?»
15 А Ён, ведаючы крывадушнасьць іхнюю, сказаў ім: «Чаму Мяне спакушаеце? Прынясіце Мне
дынар, каб Я пабачыў».
16 Яны прынесьлі. І гаворыць ім: «Чый гэта вобраз і надпіс?» Яны сказалі Яму: «Цэзараў».
17 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Аддавайце тое, што цэзарава, цэзару, а тое, што Божае, —
Богу». І зьдзіўляліся з Яго.
18 І прыходзяць да Яго садукеі, якія кажуць, што няма ўваскрасеньня, і спыталіся ў Яго,
кажучы:
19 «Настаўнік, Майсей напісаў нам: “Калі памрэ нечый брат і пакіне жонку, а дзяцей не пакіне,
дык брат ягоны мае ўзяць жонку яго і аднавіць насеньне брату свайму”.
20 Было сем братоў, і першы ўзяў жонку, і, паміраючы, не пакінуў насеньня.
21 І другі ўзяў яе, і памёр, і не пакінуў насеньня, і трэці гэтаксама.
22 І бралі яе сямёра, і не пакінулі насеньня. Пасьля ўсіх памерла і жанчына.
23 Дык пры ўваскрасеньні, калі яны ўваскрэснуць, якога з іх будзе яна жонкаю? Бо сямёра мелі
яе за жонку».
24 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Ці ж не таму вы памыляецеся, што ня ведаеце ані Пісаньня,
ані моцы Божай?
25 Бо калі ўвасрэснуць з мёртвых, ня будуць ані жаніцца, ані замуж выходзіць, але будуць як
анёлы, якія ў небе.
26 А пра мёртвых, што яны ўстануць, ці ж вы не чыталі ў кнізе Майсея, як Бог з куста сказаў да
яго, кажучы: “Я — Бог Абрагама, і Бог Ісаака, і Бог Якуба”?
27 Ён ня ёсьць Бог мёртвых, але Бог жывых! Таму вы моцна памыляецеся».
28 І адзін з кніжнікаў, падыйшоўшы і пачуўшы, як яны пыталіся, і бачачы, што добра ім адказаў,
спытаўся ў Яго: «Якое першае з усіх прыказаньняў?»
29 Ісус адказаў яму: «Першае з усіх прыказаньняў: “Слухай, Ізраіль! Госпад, Бог наш — Госпад
адзіны”,

30 і: “Любі Госпада, Бога твайго, усім сэрцам тваім, усёю душой тваёй, усім разуменьнем тваім
і ўсёю моцаю тваёю”.
31 І другое, падобнае да яго: “Любі бліжняга свайго як самога сябе”. Іншага прыказаньня,
большага за гэтыя, няма».
32 І сказаў Яму кніжнік: «Добра, Настаўнік! Праўду Ты сказаў, што адзін ёсьць Бог, і няма
іншага апрача Яго.
33 І любіць Яго ўсім сэрцам, усім розумам, усёю душою ды ўсёю моцаю, і любіць бліжняга як
самога сябе больш, чым усе цэласпаленьні і ахвяры».
34 І Ісус, бачачы, што разумна ён адказаў, сказаў яму: «Недалёка ты ад Валадарства Божага». І
ніхто ўжо болей не адважваўся пытацца ў Яго.
35 І, адказваючы, гаварыў Ісус, навучаючы ў сьвятыні: «Чаму кніжнікі кажуць, што Хрыстос
ёсьць сынам Давіда?
36 Бо сам Давід сказаў праз Духа Сьвятога: “Сказаў Госпад Госпаду майму: "Сядзь праваруч
Мяне, пакуль пакладу ворагаў Тваіх як падножжа ног Тваіх"”.
37 Сам Давід называе Яго Госпадам, дык як жа Ён — сын ягоны?» І вялізарны натоўп з ахвотай
слухаў Яго.
38 І гаварыў ім у вучэньні Сваім: «Паглядзіце на кніжнікаў, якія любяць хадзіць у доўгіх шатах
і прывітаньні на рынку,
39 і першыя месцы ў сынагогах, і ўзьлягаць на першых месцах на вячэрах,
40 якія аб’ядаюць дамы ўдоваў і дзеля віду доўга моляцца. Яны атрымаюць цяжэйшы прысуд».
41 І Ісус, сеўшы насупраць скарбніцы, глядзеў, як натоўп кідае медзь у скарбніцу. І многія
багатыя кідалі шмат.
42 І, прыйшоўшы, адна ўбогая ўдава кінула дзьве лепты, гэта значыць, кадрант.
43 І, паклікаўшы вучняў Сваіх, Ён гаворыць ім: «Сапраўды кажу вам, што гэтая ўбогая ўдава
ўкінула больш за ўсіх, хто кідаў у скарбніцу.
44 Бо ўсе кідалі з лішку свайго, а яна з нястачы сваёй укінула ўсё, што мела, усё сваё
ўтрыманьне».

Мк 13

1 І калі выходзіў Ён са сьвятыні, гаворыць Яму адзін з вучняў Ягоных: «Настаўнік, паглядзі,
якія камяні ды якія пабудовы!»
2 А Ісус, адказваючы, сказаў яму: «Бачыш усе гэтыя вялізарныя пабудовы? Не застанецца
камяня на камяні, які б ня быў зруйнаваны».
3 І калі Ён сядзеў на гары Аліўнай насупраць сьвятыні, спыталіся ў Яго насамоце Пётар, і Якуб,
і Ян, і Андрэй:
4 «Скажы нам, калі гэта станецца, і які знак, калі ўсё гэта мае скончыцца?»
5 Ісус, адказваючы ім, пачаў гаварыць: «Глядзіце, каб вас хто не падмануў.
6 Бо многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы, што гэта Я, і многіх падмануць.
7 А калі пачуеце пра войны і чуткі ваенныя, не трывожцеся, бо ўсё гэта павінна стацца, але гэта
яшчэ не канец.
8 Бо паўстане народ на народ, і валадарства на валадарства, і будуць месцамі землятрусы, і
будуць голад і замяшаньні. Гэта пачатак мукаў радзін.
9 Глядзіце ж і вы самі, бо будуць вас выдаваць у сынэдрыёны і біць у сынагогах, і будзеце
пастаўленыя перад ваяводамі і валадарамі дзеля Мяне на сьведчаньне ім.
10 І ўсім народам павінна спачатку быць абвешчана Эвангельле.
11 І калі павядуць вас, каб выдаць, не клапаціцеся наперад, што маеце гаварыць, і не
абдумвайце, але што дадзена вам будзе ў гэты час, тое кажыце, бо ня вы будзеце гаварыць,
але Дух Сьвяты.
12 І выдасьць брат брата на сьмерць, і бацька сына; і дзеці паўстануць супраць бацькоў і будуць
забіваць іх,

13 і будзеце вы ў нянавісьці ў-ва ўсіх дзеля імя Майго. Але хто вытрывае да канца, будзе
збаўлены.
14 А калі ўбачыце агіду спусташэньня, як сказана праз Данііла прарока, што стане там, дзе не
павінна, — хто чытае, няхай разумее, — тады тыя, хто ў Юдэі, няхай уцякаюць у горы,
15 а хто на даху, няхай не зыходзіць у дом і не ўваходзіць узяць нешта з дому свайго,
16 і хто ў полі, няхай не вяртаецца назад узяць адзеньне сваё.
17 Але гора цяжарным і тым, што кормяць грудзьмі, у тыя дні.
18 Дык маліцеся, каб не былі ўцёкі вашыя ў зіму.
19 Бо ў тыя дні будзе такі прыгнёт, якога не было ад пачатку стварэньня, якое стварыў Бог, аж
дагэтуль, і ня будзе.
20 І калі б Госпад не скараціў гэтых дзён, не выратавалася б ніводнае цела, але дзеля выбраных,
якіх Ён выбраў, скараціў гэтыя дні.
21 І тады, калі хто вам скажа: “Вось тут Хрыстос”, ці: “Вось, там”, — ня верце.
22 Бо паўстануць фальшывыя хрысты і фальшывыя прарокі, і будуць рабіць знакі і цуды, каб
зьвесьці, калі магчыма, і выбраных.
23 Вы ж глядзіце: вось, Я вам усё наперад сказаў.
24 Але ў тыя дні, пасьля прыгнёту таго, зацьмее сонца, і месяц ня дасьць сьвятла свайго,
25 і зоркі нябесныя падаць будуць, і сілы, што ў небе, захістаюцца.
26 І тады ўгледзяць Сына Чалавечага, Які прыходзіць на аблоках з вялікай моцаю і славаю.
27 І тады Ён пашле анёлаў Сваіх, і зьбярэ выбраных Сваіх ад чатырох вятроў, ад краю зямлі да
краю неба.
28 У дрэва фігавага навучыцеся прыповесьці: калі ўжо галінка ягоная робіцца мяккай і пускае
лісты, разумееце, што блізка лета.
29 Гэтак і вы, калі ўбачыце, што гэта адбываецца, разумейце, што блізка, у дзьвярах.
30 Сапраўды кажу вам: не праміне пакаленьне гэтае, аж усё гэта станецца.
31 Неба і зямля прамінуць, але словы Мае не прамінуць.
32 А пра дзень той і гадзіну ніхто ня ведае, ані анёлы, якія ў небе, ані Сын, а толькі Айцец.
33 Глядзіце, ня сьпіце і маліцеся, бо ня ведаеце, калі прыйдзе пара.
34 Як чалавек, які, выяжджаючы, пакінуў дом свой, і даў уладу слугам сваім, і кожнаму свой
абавязак, і загадаў прыдзьверніку, каб чуваў.
35 Дык чувайце, бо ня ведаеце, калі гаспадар дому прыйдзе: вечарам, ці апоўначы, ці як певень
засьпявае, ці раніцай,
36 каб, калі вернецца неспадзявана, не знайшоў вас, што сьпіцё.
37 А што вам кажу, усім кажу: "Чувайце!"»

Мк 14

1 Праз два дні была Пасха і сьвята Праснакоў, і шукалі першасьвятары і кніжнікі, як узяць Яго
подступам і забіць,
2 але казалі: «Не на сьвята, каб не было замяшаньня ў народзе».
3 І калі Ён быў у Бэтаніі, у доме Сымона пракажонага, і ўзьляжаў [за сталом], прыйшла
жанчына з алябастравым збанком міра нардовага, чыстага і каштоўнага, і, пабіўшы алябастар,
выліла Яму на галаву.
4 І былі некаторыя, якія абураліся ў сабе і казалі: «Навошта такое марнаваньне гэтага міра?
5 Можна ж было прадаць яго даражэй, чым за трыста дынараў, і раздаць убогім». І наракалі на
яе.
6 А Ісус сказаў: «Пакіньце яе! Навошта робіце ёй прыкрасьць? Яна добры ўчынак зрабіла дзеля
Мяне.
7 Бо ўбогіх заўсёды маеце з сабою і можаце ім дабро рабіць, калі захочаце, а Мяне маеце не
заўсёды.
8 Яна, што магла, зрабіла: наперад памазала цела Маё на пахаваньне.

9 Сапраўды кажу вам: дзе толькі будзе абвешчана Эвангельле гэтае ў-ва ўсім сьвеце, будзе
сказана і пра тое, што яна зрабіла, на ўспамін пра яе».
10 І Юда Іскарыёт, адзін з Дванаццаці, пайшоў да першасьвятароў, каб выдаць Яго ім.
11 Яны ж, пачуўшы, узрадаваліся і абяцалі даць яму грошы. І ён шукаў, як у адпаведны час Яго
выдаць.
12 І ў першы дзень Праснакоў, калі заколваюць пасхальнае [ягня], кажуць Яму вучні Ягоныя:
«Дзе хочаш, каб мы пайшлі і прыгатавалі Табе есьці Пасху?»
13 І пасылае двух вучняў сваіх, і гаворыць ім: «Ідзіце ў горад, і сустрэнецца вам чалавек, які
будзе несьці збан вады; ідзіце за ім.
14 І куды ён увойдзе, скажыце ўладальніку: “Настаўнік гаворыць: ‘Дзе сьвятліца, у якой буду
есьці Пасху разам з вучнямі Маімі?’ ”
15 І ён пакажа вам залю вялікую, засланую, падрыхтаваную; там падрыхтуйце нам».
16 І пайшлі вучні Ягоныя, і прыйшлі ў горад, і знайшлі, як Ён сказаў ім, і падрыхтавалі Пасху.
17 І калі настаў вечар, прыходзіць з Дванаццацьцю.
18 І калі ўзлягалі за сталом і елі, Ісус сказаў: «Сапраўды кажу вам: Адзін з вас, што есьць са
Мною, выдасьць Мяне».
19 Яны ж засмуціліся і пачалі адзін за адным гаварыць Яму: «Ці ня я?» І іншыя: «Ці ня я?»
20 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Адзін з Дванаццаці, што мачае са Мною ў місе.
21 Што праўда, Сын Чалавечы ідзе, як напісана пра Яго, але гора таму чалавеку, праз якога Сын
Чалавечы выдаецца! Лепш было б, каб чалавек той ня быў нарадзіўшыся».
22 І калі яны елі, Ісус узяў хлеб, дабраславіўшы, паламаў і даў ім, і сказаў: «Бярыце, ешце, гэта
ёсьць Цела Маё».
23 І, узяўшы келіх, падзякаваўшы, даў ім; і пілі з яго ўсе.
24 І сказаў ім: «Гэта ёсьць Кроў Мая Новага Запавету, якая за многіх праліваецца.
25 Сапраўды кажу вам, што больш ня буду піць з гэтага плоду вінаграднага аж да таго дня, калі
буду піць новае віно ў Валадарстве Божым».
26 І, засьпяваўшы, пайшлі на гару Аліўную.
27 І кажа ім Ісус: «Усе вы згоршыцеся праз Мяне ў гэтую ноч, бо напісана: “Удару пастуха, і
будуць расьцярушаныя авечкі”,
28 але пасьля ўваскрасеньня Майго прыйду перад вамі ў Галілею».
29 А Пётар сказаў Яму: «Калі нават усе згоршацца, але ня я».
30 І кажа яму Ісус: «Сапраўды кажу табе, што ты сёньня, у гэтую ноч, перш, чым певень двойчы
запяе, тройчы адрачэшся ад Мяне».
31 Але той тым мацней гаварыў: «Хоць бы мне трэба было памерці з Табою, не адракуся ад
Цябе». Гэтак сама і ўсе гаварылі.
32 І прыходзяць у месца, званае Гетсэманія, і гаворыць вучням Сваім: «Пасядзіце тут, пакуль
Я памалюся».
33 І бярэ з Сабою Пятра, і Якуба, і Яна, і пачаў тужыць і сумаваць.
34 І кажа ім: «Смутная душа Мая аж да сьмерці, застаньцеся тут і чувайце».
35 І, адыйшоўшыся трохі, упаў на зямлю і маліўся, каб, калі магчыма, абмінула Яго гэтая
гадзіна.
36 І гаварыў: «Абба, Ойча! Усё магчыма для Цябе, пранясі ад Мяне гэты келіх, але ня тое, што
Я хачу, але што Ты!»
37 І прыходзіць, і знаходзіць іх, што яны сьпяць, і гаворыць Пятру: «Сымоне! Ты сьпіш? Ня
маеш сілы аднае гадзіны чуваць?
38 Чувайце і маліцеся, каб не ўвайсьці ў спакусу, бо дух ахвочы, а цела кволае».
39 І зноў, адыйшоўшыся, маліўся, гаворачы тое самае слова.
40 І, вярнуўшыся, знайшоў зноў, што яны сьпяць, бо вочы іхнія абцяжэлі, і ня ведалі, што Яму
адказаць.
41 І прыходзіць трэці раз, і кажа ім: «Сьпіцё яшчэ і адпачываеце? Даволі! Прыйшла гадзіна.
Вось Сын Чалавечы выдаецца ў рукі грэшнікаў.

42 Уставайце! Хадзем! Вось, наблізіўся той, хто Мяне выдае».
43 І адразу, калі Ён яшчэ гаварыў, прыходзіць Юда, адзін з Дванаццаці, а з ім вялікі натоўп з
мячамі і каламі ад першасьвятароў, і кніжнікаў, і старшыняў.
44 А той, што выдаваў Яго, даў ім знак, кажучы: «Каго я пацалую, гэта Ён, бярыце Яго і вядзіце
асьцярожна».
45 І, прыйшоўшы, адразу падыйшоў да Яго і кажа: «Раббі! Раббі!», і пацалаваў Яго.
46 Яны ж усклалі рукі свае на Яго і схапілі Яго.
47 А адзін з тых, што стаялі там, выхапіўшы меч, ударыў слугу першасьвятара і адсек яму вуха.
48 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Як на разбойніка выйшлі вы з мячамі і каламі, каб схапіць
Мяне.
49 Штодзень быў Я з вамі ў сьвятыні, навучаючы, і вы ня бралі Мяне, але няхай споўніцца
Пісаньне».
50 І, пакінуўшы Яго, усе паўцякалі.
51 І адзін юнак, апрануўшы палатніну на голае цела, ішоў за Ім, і жаўнеры схапілі яго,
52 але ён, пакінуўшы палатніну, голы ўцёк ад іх.
53 І прывялі Ісуса да першасьвятара, і зьбіраюцца да яго ўсе першасьвятары, і старшыні, і
кніжнікі.
54 І Пётар здалёк ішоў за Ім ажно на панадворак першасьвятара, і сядзеў з паслугачамі і грэўся
пры агні.
55 А першасьвятары і ўвесь сынэдрыён шукалі сьведчаньня супраць Ісуса, каб аддаць Яго на
сьмерць, і не знаходзілі.
56 Бо шмат хто фальшыва сьведчыў супраць Яго, але іхнія сьведчаньні не былі згоднымі.
57 І некаторыя, падняўшыся, фальшыва сьведчылі супраць Яго, кажучы:
58 «Мы чулі, як Ён казаў: “Я зруйную бажніцу гэтую, зробленую рукамі, і праз тры дні збудую
іншую, якая не рукамі зробленая”».
59 Але і іх сьведчаньні не былі згоднымі.
60 І першасьвятар, стаўшы на сярэдзіне, спытаўся ў Ісуса, кажучы: «Нічога не адказваеш? Што
яны супраць Цябе сьведчаць?»
61 А Ён маўчаў і нічога не адказваў. Зноў першасьвятар спытаўся ў Яго і гаворыць Яму: «Ці Ты
— Хрыстос, Сын Дабраслаўлёнага?»
62 А Ісус сказаў: «Гэта Я, і вы ўгледзіце Сына Чалавечага, Які сядзіць праваруч Моцы і Які ідзе
на аблоках нябесных».
63 Тады першасьвятар, разьдзёршы вопраткі свае, кажа: «Нашто патрэбны нам яшчэ сьведкі?
64 Вы чулі блюзьнерства? Як вам здаецца?» Тыя ж усе прысудзілі, што Ён варты сьмерці.
65 І некаторыя пачалі пляваць на Яго, і засланяць аблічча Яго, і біць Яго, і гаварыць Яму:
«Прароч!» І паслугачы білі Яго па шчоках.
66 І калі Пётар быў на панадворку ўнізе, прыходзіць адна са служак першасьвятара
67 і, убачыўшы Пятра, які грэўся, і прыгледзеўшыся да яго, кажа: «І ты быў з Ісусам з
Назарэту?»
68 Але ён адрокся, кажучы: «Ня ведаю і не разумею, што ты гаворыш». І выйшаў вонкі на
пярэдні панадворак, і запяяў певень.
69 І служка, зноў убачыўшы яго, пачала казаць тым, што стаялі побач: «Гэты адзін з іх».
70 А ён зноў адрокся. І, неўзабаве, тыя, што там стаялі, зноў кажуць Пятру: «Праўда, ты з іх,
бо ты — Галілеец, і гаворка твая падобная».
71 А ён пачаў клясьціся і прысягаць: «Ня ведаю Чалавека Гэтага, пра Якога гаворыце».
72 І другі раз запяяў певень, і ўзгадаў Пётар слова, якое сказаў яму Ісус: «Перш, чым певень
двойчы запяе, ты тройчы адрачэшся ад Мяне». І пачаў плакаць.

Мк 15

1 І адразу раніцаю, зрабіўшы нараду, першасьвятары са старшынямі і кніжнікамі, і ўвесь
сынэдрыён, зьвязаўшы Ісуса, павялі і выдалі Пілату.

2 І спытаўся ў Яго Пілат: «Ты — Валадар Юдэйскі?» А Ён, адказваючы, гаворыць яму: «Ты
кажаш».
3 І вінавацілі Яго першасьвятары ў многім.
4 А Пілат зноў спытаўся ў Яго: «Нічога не адказваеш? Глядзі, як шмат сьведчаць супраць
Цябе?»
5 Але Ісус больш нічога не адказваў, так што Пілат зьдзівіўся.
6 А на сьвята ён звальняў ім аднаго з вязьняў, за якога прасілі.
7 Быў жа адзін, называны Барабба, увязьнены разам з супольнікамі, якія пад час паўстаньня
ўчынілі забойства.
8 І, закрычаўшы, натоўп пачаў прасіць таго, што рабіў ім заўсёды.
9 А Пілат адказаў ім, кажучы: «Хочаце, адпушчу вам Валадара Юдэйскага?»
10 Бо ведаў, што першасьвятары праз зайздрасьць выдалі Яго.
11 Але першасьвятары падбухторылі натоўп, каб лепш адпусьціў ім Бараббу.
12 Дык Пілат, адказваючы, зноў сказаў ім: «Што вы хочаце, каб я зрабіў з Тым, Каго называеце
Валадаром Юдэйскім?»
13 Але яны зноў закрычалі: «Укрыжуй Яго!»
14 Пілат жа сказаў ім: «Што ліхога ўчыніў Ён?» Але яны яшчэ мацней крычалі: «Укрыжуй
Яго!»
15 Дык Пілат, хочучы дагадзіць натоўпу, адпусьціў ім Бараббу, а Ісуса, убічаваўшы, выдаў на
ўкрыжаваньне.
16 І жаўнеры завялі Яго на панадворак, што завецца прэторыя, і склікаюць усю кагорту.
17 І апранаюць Яго ў пурпур, і, сплёўшы вянок з церняў, ускладаюць на Яго.
18 І пачалі вітаць Яго: «Радуйся, Валадару Юдэйскі!»
19 І білі Яго трысьцінай па галаве, і плявалі на Яго, і, кленчучы, пакланяліся Яму.
20 І калі назьдзекваліся з Яго, зьнялі з Яго пурпур, і апранулі Яго ў адзеньне Ягонае. І вядуць
Яго, каб Яго ўкрыжаваць.
21 І прымушаюць нейкага Сымона Кірэнэйца, бацьку Аляксандра і Руфа, які ішоў з поля і
праходзіў міма, каб узяў крыж Ягоны.
22 І прыводзяць Яго на Галгофу, месца, што перакладаецца Месца Чэрапа.
23 І далі Яму піць віно, зьмяшанае са сьмірнай, але Ён не прыняў.
24 І тыя, што крыжавалі Яго, падзялілі адзеньне Ягонае, кідаючы жэрабя, хто мае яго ўзяць.
25 А была гадзіна трэцяя, і ўкрыжавалі Яго.
26 І быў надпіс віны Ягонай напісаны: «Валадар Юдэйскі».
27 І разам з Ім укрыжавалі двух разбойнікаў, аднаго праваруч, а другога леваруч Яго.
28 І споўнілася Пісаньне: «І да беззаконьнікаў залічаны».
29 І тыя, што праходзілі міма, блюзьнілі на Яго, ківаючы галовамі сваімі і кажучы: «Гэй, Ты,
Які руйнуеш бажніцу і ў тры дні адбудоўваеш,
30 выратуй Сябе Самога і зыйдзі з крыжа».
31 Падобна і першасьвятары, насьміхаючыся, гаварылі з кніжнікамі адзін аднаму: «Іншых
ратаваў, а Сябе ўратаваць ня можа.
32 Хрыстос, Валадар Ізраіля, няхай зыйдзе цяпер з крыжа, каб мы ўбачылі і паверылі». І тыя,
што былі ўкрыжаваныя з Ім, зьневажалі Яго.
33 А калі настала гадзіна шостая, сталася цемра па ўсёй зямлі ажно да гадзіны дзявятай.
34 І а дзявятай гадзіне Ісус загаласіў моцным голасам, кажучы: «Элёі, элёі, ламма сабахтані»,
што перакладаецца: «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты Мяне пакінуў?»
35 І некаторыя з тых, што вакол стаялі, пачуўшы, казалі: «Вось, Ільлю кліча».
36 А адзін, пабегшы і напоўніўшы губку воцатам ды ўсклаўшы яе на трысьціну, даваў Яму піць,
гаворачы: «Пакіньце, паглядзім, ці прыйдзе Ільля зьняць Яго».
37 Ісус жа, усклікнуўшы моцным голасам, аддаў духа.
38 І заслона ў бажніцы была разьдзёртая надвое ад верху да нізу.

39 Сотнік жа, што стаяў насупраць Яго, убачыўшы, што так закрычаўшы, аддаў духа, сказаў:
«Праўда, Чалавек Гэты быў Сын Божы».
40 Былі таксама жанчыны, што глядзелі здалёк, між імі Марыя Магдалена, і Марыя, маці Якуба
меншага і Ёсіі, і Салямэя,
41 якія, калі Ён быў у Галілеі, хадзілі за Ім і паслугавалі Яму, і шмат іншых, што прыйшлі з Ім у
Ерусалім.
42 І калі ўжо настаў вечар, — а быў гэта дзень прыгатаваньня, які ёсьць перад суботаю, —
43 прыйшоў Язэп з Арыматэі, паважаны ратман, які сам чакаў Валадарства Божага. Адважыўшыся, ён увайшоў да Пілата і прасіў цела Ісуса.
44 А Пілат зьдзівіўся, што Ён ужо памёр, і паклікаўшы сотніка, спытаўся ў яго, ці даўно памёр,
45 і, даведаўшыся ад сотніка, аддаў цела Язэпу.
46 І той, купіўшы палатніну і зьняўшы Яго [з крыжа], ахінуў палатнінаю і палажыў Яго ў магілу,
якая была высечаная ў скале, і прываліў камень да ўваходу ў магілу.
47 А Марыя Магдалена і Марыя Ёсіева глядзелі, дзе палажылі Яго.

Мк 16

1 І калі мінула субота, Марыя Магдалена, і Марыя Якубава, і Салямэя купілі духмянасьцяў, каб
пайсьці памазаць Яго.
2 І вельмі рана, у першы дзень пасьля суботы, прыходзяць да магілы, калі ўзыходзіла сонца.
3 І гаварылі між сабою: «Хто нам адваліць камень ад уваходу ў магілу?»
4 І, глянуўшы, бачаць, што камень адвалены, а быў ён надта вялікі.
5 І, увайшоўшы ў магілу, убачылі юнака, апранутага ў белую шату, які сядзеў з правага боку, і
напалохаліся.
6 А ён кажа ім: «Не палохайцеся! Вы шукаеце Ісуса з Назарэту, укрыжаванага? Ён уваскрос.
Няма Яго тут. Вось месца, дзе палажылі Яго.
7 Але ідзіце, скажыце вучням Ягоным і Пятру: “Ён ідзе перад вамі ў Галілею; там Яго ўгледзіце,
як Ён сказаў вам”».
8 І яны, выйшаўшы, пабеглі ад магілы, і ахапіла іх трымценьне і захапленьне, і нікому нічога
не сказалі, бо баяліся.
9 Уваскросшы раніцаю ў першы дзень пасьля суботы, Ісус зьявіўся спачатку Марыі Магдалене,
з якой выгнаў сем дэманаў.
10 Яна, пайшоўшы, паведаміла тым, што з Ім былі, якія плакалі і галасілі.
11 Але тыя, пачуўшы, што Ён жывы і яна бачыла Яго, не паверылі.
12 Пасьля гэтага Ён зьявіўся ў іншым выглядзе дваім з іх у дарозе, як ішлі ў вёску.
13 І тыя, вярнуўшыся, паведамілі іншым, але і ім не паверылі.
14 Нарэшце Ён зьявіўся Адзінаццаці, калі яны ўзьлягалі пры стале, і дакараў за недаверства
іхняе і жорсткасьць сэрца, што не паверылі тым, якія бачылі Яго ўваскросшага.
15 І сказаў ім: «Ідзіце на ўвесь сьвет і абвяшчайце Эвангельле ўсяму стварэньню.
16 Хто паверыць і ахрысьціцца, будзе збаўлены, а хто не паверыць, будзе асуджаны.
17 А тым, што паверацъ, будуць такія знакі: у імя Маё выганяць будуць дэманаў, новымі мовамі
гаварыць будуць,
18 зьмеяў браць будуць, і калі што сьмяротнае вып’юць, не пашкодзіць ім, на нямоглых рукі
ўскладуць, і яны будуць здаровыя».
19 Госпад жа пасьля размовы з імі ўзьнёсься ў неба і сеў праваруч Бога.
20 А яны, пайшоўшы, абвяшчалі паўсюль Госпада, Які дапамагаў ім і сьцьвярджаў словы
знакамі, якія іх суправаджалі. Амэн.

ЭВАНГЕЛЬЛЕ ПАВОДЛЕ ЛУКІ

1 Як ужо многія намагаліся напісаць аповесьць пра падзеі, якія ў нас адбыліся,
2 як пераказалі нам тыя, што былі ад пачатку відавочцамі і сталіся паслугачамі Слова,
3 надумаў і я, прайшоўшы ўсё нанова, дакладна па парадку апісаць табе, вяльможны Тэафілю,
4 каб ты пазнаў надзейнасьць словаў, у якіх быў навучаны.
5 Сталася ў дні Ірада, валадара Юдэйскага, [быў] сьвятар з Абіявае чаргі, на імя Захарыя, і жонка ягоная з дачок Аарона, і імя яе — Альжбета.
6 Былі яны абое праведныя перад Богам, ходзячы паводле прыказаньняў і пастановаў Госпада беззаганна.
7 І не было ў іх дзіцяці, таму што Альжбета была няплодная, і абое яны былі пажылыя ў гадах сваіх.
8 І сталася, калі ў парадку чаргі сваёй ён спаўняў абавязак сьвятарскі перад Богам,
9 выпала яму паводле звычаю сьвятароў кадзіць, увайшоўшы ў бажніцу Госпадаву.
10 І ўсё мноства народу звонку малілася ў час каджэньня.
11 І зьявіўся яму анёл Госпада, які стаў з правага боку кадзільнага ахвярніку.
12 І ўстрывожыўся Захарыя, убачыўшы яго, і ахапіў яго страх.
13 Анёл жа сказаў яму: «Ня бойся, Захарыя! Бо пачутая просьба твая, і жонка твая Альжбета народзіць табе сына, і дасі яму імя Ян.
14 І будзе табе радасьць і вясёласьць, і многія ўзрадуюцца нараджэньню ягонаму.
15 Бо ён будзе вялікі перад Госпадам, і ня будзе піць віно і сікеру, і Духам Сьвятым напоўніцца яшчэ ва ўлоньні маці сваёй.
16 І многіх з сыноў Ізраіля зьверне да Госпада, Бога іхняга.
17 І будзе ісьці перад Ім у духу і сіле Ільлі, каб вярнуць сэрцы бацькоў дзецям, і непаслухмяным — лад думак праведнікаў, каб падрыхтаваць Госпаду народ падрыхтаваны».
18 І сказаў Захарыя анёлу: «З чаго даведаюся я гэтае? Бо я — стары, і жонка мая ў гадах пажылых».
19 І, адказваючы, сказаў яму анёл: «Я — Габрыэль, які стаю перад Богам, і я пасланы гаварыць з табою і дабравесьціць табе гэтае.
20 І вось, будзеш ты маўчаць, і ня зможаш гаварыць да дня, калі гэта станецца, за тое, што не паверыў словам маім, якія споўняцца ў свой час».
21 І чакаў народ Захарыю, і дзівіўся, што ён марудзіць у бажніцы.
22 А ён, выйшаўшы, ня мог гаварыць да іх; і зразумелі, што бачыў відзеж у бажніцы; і ён ківаў ім, і застаўся немы.
23 І сталася, калі скончыліся дні службы ягонай, ён вярнуўся ў дом свой.
24 Пасьля гэтых дзён зачала Альжбета, жонка ягоная, і хавала гэта пяць месяцаў, кажучы:
25 «Гэтак учыніў мне Госпад у дні, калі глянуў на мяне, каб зьняць з мяне ганьбу між людзьмі».
26 А ў шосты месяц быў пасланы анёл Габрыэль ад Бога ў горад Галілейскі, называны Назарэт,
27 да дзяўчыны, заручанай з мужам на імя Язэп, з дому Давіда; а імя дзяўчыны — Марыя.
28 І, увайшоўшы да яе, анёл сказаў: «Радуйся, дабрадатная! Госпад з табою; дабраслаўлёная ты між жанчынамі».
29 Яна ж, убачыўшы яго, устрывожылася ад словаў ягоных і разважала, што гэта было за прывітаньне.
30 І сказаў ёй анёл: «Ня бойся, Марыя! Бо ты знайшла ласку ў Бога.
31 І вось, ты зачнеш ва ўлоньні і народзіш Сына, і дасі Яму імя Ісус.
32 Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца, і дасьць Яму Госпад Бог пасад Давіда, бацькі Ягонага.
33 І Ён будзе валадарыць над домам Якуба на вякі, і Валадарству Ягонаму ня будзе канца».
34 А Марыя сказала анёлу: «Як гэта будзе, калі я не спазнала мужа?»

35 І, адказваючы, анёл сказаў ёй: «Дух Сьвяты зыйдзе на цябе, і сіла Найвышэйшага ахіне цябе.
І дзеля гэтага тое, што народзіцца Сьвятое, Сынам Божым назавецца.
36 Вось і Альжбета, сваячка твая, і яна зачала сына ў старасьці сваёй, і вось ужо шосты месяц у
яе, якую называюць няплоднай.
37 Бо ў Бога ніводнае слова ня будзе бяз сілы».
38 І сказала Марыя: «Вось я — служка Госпада; няхай станецца мне паводле слова твайго». І
адыйшоў ад яе анёл.
39 Устаўшы, Марыя ў тыя дні шпарка пайшла ў горную краіну, у горад Юды,
40 і ўвайшла ў дом Захарыі, і прывітала Альжбету.
41 І сталася, калі Альжбета пачула прывітаньне Марыі, узварухнулася дзіцятка ва ўлоньні яе,
і Альжбета напоўнілася Духам Сьвятым.
42 І ўсклікнула яна моцным голасам, і сказала: «Дабраслаўлёная ты між жанчынамі, і
дабраслаўлёны плод улоньня твайго.
43 І адкуль гэта мне, што прыйшла маці Госпада майго да мяне?
44 Бо вось, як голас вітаньня твайго дайшоў да вушэй маіх, узварухнулася вясёла дзіцятка ва
ўлоньні маім.
45 І шчасьлівая тая, якая паверыла, бо зьдзейсьніцца сказанае ёй ад Госпада».
46 І сказала Марыя: «Узьвялічвае душа мая Госпада,
47 і ўзрадаваўся дух мой у Богу, Збаўцы маім,
48 бо Ён глянуў на паніжэньне служкі Сваёй. Бо вось, адгэтуль шчасьліваю будуць называць
мяне ўсе пакаленьні,
49 бо вялікае ўчыніў мне Магутны, і сьвятое імя Яго,
50 і міласэрнасьць Ягоная з пакаленьня ў пакаленьне для тых, якія баяцца Яго.
51 Ён зьявіў уладу рамяном Сваім, расьсеяў ганарыстых думкамі сэрца іхняга;
52 скінуў моцных з пасадаў і ўзьвялічыў пакорных;
53 галодных насыціў дабром, а багатых адпусьціў ні з чым.
54 Падтрымаў Ізраіля, юнака Свайго, успомніў пра міласэрнасьць,
55 як гаварыў адносна бацькоў нашых, адносна Абрагама і насеньня ягонага на вякі».
56 Прабыла ж Марыя з ёю каля трох месяцаў і вярнулася ў дом свой.
57 А Альжбеце настаў час нараджаць, і яна нарадзіла сына.
58 І пачулі суседзі і сваякі ейныя, што ўзьвялічыў Госпад міласэрнасьць Сваю над ёю, і цешыліся
з ёю.
59 І сталася, у восьмы дзень прыйшлі абрэзаць дзіцятка і хацелі назваць яго паводле імя бацькі
ягонага Захарыям.
60 І, адказваючы, маці ягоная сказала: «Не, але ён будзе называцца Янам».
61 І сказалі ёй: «Нікога няма ў родзічаў тваіх, хто называецца гэтым імем».
62 І пыталіся на мігах у бацькі ягонага, як бы ён хацеў назваць яго.
63 І, папрасіўшы дошчачку, ён напісаў, кажучы: «Ян імя яму». І ўсе зьдзівіліся.
64 І адразу расчыніліся вусны ягоныя і язык ягоны, і ён стаў гаварыць, дабраслаўляючы Бога.
65 І стаўся страх на ўсіх, што жылі побач, і гаварылі адзін аднаму словы гэтыя па ўсёй горнай
краіне Юдэйскай.
66 І ўсе, якія чулі, складалі [гэта] ў сэрцы сваім, кажучы: «Што ж гэта будзе за дзіця?» І рука
Госпада была з ім.
67 І Захарыя, бацька ягоны, напоўніўся Духам Сьвятым, і прарочыў, кажучы:
68 «Дабраслаўлёны Госпад, Бог Ізраіля, што адведаў народ Свой і даў выбаўленьне [яму],
69 і падняў рог збаўленьня нашага ў доме Давіда, слугі Свайго,
70 як абвясьціў вуснамі сьвятых прарокаў Сваіх, што былі адвеку,
71 збавіць [нас] ад ворагаў нашых і ад рукі ўсіх, якія ненавідзяць нас,
72 учыніць міласэрнасьць бацькам нашым і ўзгадаць сьвяты запавет Свой,
73 прысягу, якой кляўся Абрагаму, бацьку нашаму, даць нам

74 бяз страху, выбавіўшы нас з рукі ворагаў нашых,
75 служыць Яму ў сьвятасьці і праведнасьці перад Ім у-ва ўсе дні жыцьця нашага.
76 І ты, дзіцятка, будзеш названы прарокам Найвышэйшага, бо будзеш ісьці наперадзе перад абліччам Госпада падрыхтаваць шляхі Яму,
77 даць народу пазнаць збаўленьне ў адпушчэньні грахоў іхніх,
78 праз унутраную міласэрнасьць Бога нашага, у якой адведаў нас Усход з вышыні,
79 зьявіць [сьвятло] тым, што сядзяць у цемры і ў ценю сьмяротным, накіраваць ногі нашыя на шлях супакою».
80 А дзіцятка ўзрастала і ўмацоўвалася духам, і было ў пустыні да дня зьяўленьня свайго Ізраілю.

Лк 2

1 І сталася, у тыя дні выйшла ад цэзара Аўгуста пастанова зрабіць перапіс па ўсім сусьвеце.
2 Гэты перапіс быў першы за панаваньня Квірынія ў Сірыі.
3 І пайшлі ўсе запісвацца, кожны ў свой горад.
4 Пайшоў таксама і Язэп з Галілеі, з гораду Назарэт, у Юдэю, у горад Давіда, называны Бэтлеем, бо ён быў з дому і роду Давіда,
5 запісацца з Марыяю, заручанай з ім жонкай, якая была цяжарная.
6 І сталася, калі яны былі там, надыйшоў дзень нарадзіць ёй;
7 і нарадзіла Сына свайго Першароднага, і спавіла Яго, і палажыла Яго ў ясьлі, бо не было ім месца ў сьвятліцы.
8 І былі пастухі ў той ваколіцы, якія начавалі ў полі і вартавалі ўначы каля статку свайго.
9 І вось, стаў перад імі анёл Госпада, і слава Госпада асьвяціла іх; і спалохаліся страхам вялікім.
10 І сказаў ім анёл: «Ня бойцеся! Бо вось, я дабравешчу вам радасьць вялікую, якая будзе ўсяму народу,
11 бо сёньня нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, Які ёсьць Хрыстос Госпад.
12 І вось вам знак: вы знойдзеце Немаўлятка ў пялюшках, Якое ляжыць у ясьлях».
13 І неспадзявана зьявілася з анёлам шматлікае войска нябеснае, якое хваліла Бога і казала:
14 «Слава на вышынях Богу, а на зямлі супакой, у людзях упадабаньне».
15 І сталася, калі адыйшлі ад іх анёлы ў неба, пастухі сказалі адзін аднаму: «Хадзем у Бэтлеем і ўбачым, ці сталася тое слова, якое абвясьціў нам Госпад».
16 І пайшлі пасьпешна, і знайшлі Марыю і Язэпа, і Немаўлятка, Якое ляжала ў ясьлях.
17 І, убачыўшы, расказалі пра словы, якія былі сказаныя ім пра Дзіцятка Гэтае.
18 І ўсе, якія чулі, зьдзіўляліся з таго, што расказвалі ім пастухі.
19 А Марыя захавала ўсе словы гэтыя, складаючы [іх] у сэрцы сваім.
20 І вярнуліся пастухі, славячы і хвалячы Бога за ўсё, што чулі і бачылі, як ім было сказана.
21 І калі прайшло восем дзён, трэба было абрэзаць Хлопчыка, і далі Яму імя Ісус, названае анёлам перш, чым быў Ён зачаты ва ўлоньні.
22 І калі скончыліся дні ачышчэньня іх паводле Закону Майсея, прынесьлі Яго ў Ерусалім, каб прадставіць перад Госпадам,
23 як напісана ў Законе Госпада: «Усякі хлопчык, які адкрывае ўлоньне, будзе названы сьвятым Госпада»,
24 і каб прынесьці ў ахвяру паводле таго, як сказана ў Законе Госпада, пару туркавак ці двух галубнятак.
25 І вось, быў у Ерусаліме чалавек на імя Сымон. І быў ён чалавек праведны і пабожны, які чакаў пацяшэньня Ізраіля, і Дух Сьвяты быў на ім.
26 І было яму сказана ад Духа Сьвятога, што ён ня ўбачыць сьмерці, пакуль ня ўбачыць Хрыста Госпадавага.
27 І прыйшоў ён у Духу ў сьвятыню. І калі бацькі прынесьлі Дзіцятка Ісуса, каб выканаць над Ім абрад паводле Закону,
28 ён узяў Яго на рукі свае, і дабраславіў Бога, і сказаў:

29 «Цяпер адпускаеш слугу Твайго, Уладару, паводле слова Твайго, у супакоі,
30 бо бачылі вочы мае збаўленьне Тваё,
31 якое прыгатаваў Ты перад абліччам усіх народаў,
32 сьвятло для асьветы паганаў, і славу народу Твайго, Ізраіля».
33 А Язэп і маці Ягоная зьдзіўляліся сказанаму пра Яго.
34 І дабраславіў іх Сымон, і сказаў Марыі, маці Ягонай: «Вось, ляжыць Гэты на падзеньне і паўстаньне многіх у Ізраілі, і на знак, якому працівіцца будуць.
35 І табе самой меч пранікне ў душу, каб выявіліся думкі многіх сэрцаў».
36 І была Ганна прарочыца, дачка Фануэля, з калена Асэра. Яна была ў вельмі старым веку, з мужам ад дзявоцтва свайго пражыла сем гадоў.
37 І была яна ўдава гадоў васьмідзесяці чатырох, якая не адыходзіла ад сьвятыні, постам і просьбаю служачы [Богу] дзень і ноч.
38 І яна, у тую гадзіну прыйшоўшы, узносіла хвалу Госпаду і гаварыла пра Яго ўсім, якія чакалі выбаўленьня ў Ерусаліме.
39 І калі яны выканалі ўсё паводле Закону Госпада, вярнуліся ў Галілею, у горад свой Назарэт.
40 А Дзіцятка ўзрастала і ўмацоўвалася духам, напаўняючыся мудрасьцю; і ласка Божая была на Ім.
41 І кожны год бацькі Ягоныя хадзілі ў Ерусалім на сьвята Пасхі.
42 І калі Ён меў дванаццаць гадоў, прыйшлі яны, як звычайна, у Ерусалім на сьвята.
43 І калі скончыліся тыя дні і яны варочаліся, застаўся Хлопец Ісус у Ерусаліме, і не заўважылі гэтага Язэп і маці Ягоная,
44 але думалі, што Ён ідзе з іншымі падарожнікамі. Прайшоўшы дзённую дарогу, сталі шукаць Яго між сваякамі і знаёмымі.
45 І, не знайшоўшы Яго, вярнуліся ў Ерусалім, шукаючы Яго.
46 І сталася, праз тры дні знайшлі Яго ў сьвятыні, як сядзеў сярод настаўнікаў, слухаючы іх і пытаючыся ў іх.
47 І ўсе, што слухалі Яго, дзівіліся з розуму і адказаў Ягоных.
48 І, убачыўшы Яго, зьдзівіліся, і маці Ягоная сказала Яму: «Дзіця! Што Ты зрабіў нам гэтак? Вось, бацька Твой і я з вялікай мукаю шукалі Цябе».
49 А Ён сказаў ім: «Навошта вы шукалі Мяне? Ці ж вы ня ведаеце, што Я мушу быць у тым, што [належыць] Айцу Майму?»
50 І яны не зразумелі слова, якое Ён сказаў ім.
51 І Ён пайшоў з імі, і прыйшоў у Назарэт, і быў паслухмяны ім. І маці Ягоная захоўвала ўсе словы гэтыя ў сэрцы сваім.
52 І Ісус узрастаў у мудрасьці, і ва ўзросьце, і ў ласцы ў Бога і людзей.

Лк 3

1 А ў пятнаццаты год панаваньня цэзара Тыбэрыя, калі Понтый Пілат панаваў у Юдэі, Ірад быў тэтрархам у Галілеі, Філіп, брат ягоны, — тэтрархам у Ітурэі і раханіцкай краіне, а Лісані — тэтрархам у Абіліне,
2 пры першасьвятарах Аньне і Каяфе было слова Божае да Яна, сына Захарыі, у пустыні.
3 І ён праходзіў па ўсіх ваколіцах Ярданскіх, прапаведуючы хрышчэньне навяртаньня дзеля адпушчэньня грахоў,
4 як напісана ў кнізе словаў прарока Ісаі, які кажа: «Голас таго, хто кліча ў пустыні: “Падрыхтуйце шлях Госпаду, простымі рабіце сьцежкі Яго;
5 усякі дол няхай напоўніцца, і ўсякая гара і ўзгорак няхай панізяцца, крывізны няхай выпрастуюцца, і няроўныя шляхі зробяцца гладкімі;
6 і ўгледзіць усякае цела збаўленьне Божае”».
7 І казаў ён натоўпам, якія прыходзілі хрысьціцца ў яго: «Спараджэньні яхідны, хто перасьцярог вас, каб уцякалі ад гневу, які надыходзіць?

8 Зрабіце плады, годныя навяртаньня, і не пачынайце гаварыць у сабе: “Бацьку маем
Абрагама”, бо кажу вам, што Бог можа з камянёў гэтых падняць дзяцей Абрагаму.
9 Ужо і сякера ля кораня дрэваў ляжыць; усякае дрэва, якое не прыносіць добрага плоду,
сьсякаецца і кідаецца ў агонь».
10 І спытаўся ў яго натоўп, кажучы: «Дык што нам рабіць?»
11 А ён, адказваючы, кажа ім: «Хто мае дзьве вопраткі, няхай дасьць таму, хто ня мае; і хто
мае ежу, няхай робіць тое самае».
12 Прыйшлі і мытнікі хрысьціцца, і сказалі яму: «Настаўнік, што нам рабіць?»
13 А ён сказаў ім: «Нічога не бярыце больш таго, што вам загадана».
14 Пыталіся ў яго таксама жаўнеры, кажучы: «А нам што рабіць?» І ён сказаў ім: «Нікога ня
крыўдзьце, не абвінавачвайце фальшыва і задавальняйцеся платай сваёй».
15 І народу, які чакаў і разважаў у сэрцах сваіх адносна Яна, ці не Хрыстос ён,
16 адказаў Ян усім, кажучы: «Я хрышчу вас вадою, але ідзе Дужэйшы за мяне, у Якога я ня
варты разьвязаць рамень сандалаў Ягоных. Ён будзе хрысьціць вас Духам Сьвятым і агнём.
17 Веялка Ягоная ў руцэ Яго, і Ён ачысьціць ток Свой, і зьбярэ пшаніцу ў сьвіран Свой, а салому
спаліць агнём незгасальным».
18 І шмат іншага дабравесьціў ён народу, навучаючы яго.
19 А Ірад тэтрарх, дакараны ім за Ірадыяду, жонку Філіпа, брата ягонага, і за ўсё, што Ірад зрабіў
злога,
20 дадаў да ўсяго і тое, што замкнуў Яна ў вязьніцу.
21 І сталася, калі хрысьціўся ўвесь народ, і Ісус, ахрысьціўшыся, маліўся, адчынілася неба,
22 і Дух Сьвяты зыйшоў на Яго ў цялесным выглядзе, як голуб, і быў голас з неба, які казаў:
«Ты — Сын Мой Улюбёны; у Табе Я маю ўпадабаньне».
23 І меў Ісус, пачынаючы [служэньне], гадоў каля трыццаці, і быў, як думалі, сын Язэпаў,
Гэліяў,
24 Мататаў, Левіяў, Мэльхіяў, Янаяў, Язэпаў,
25 Мататыяў, Амосаў, Навумаў, Эсьліяў, Нагеяў,
26 Магатаў, Мататыяў, Сэмэяў, Язэпаў, Юдаў,
27 Яанаяў, Рэсаеў, Зэрубабэляў, Салятыэляў, Нэрыяў,
28 Мэльхіяў, Аддыяў, Касамаў, Эльмадамаў, Іраў,
29 Ёсіяў, Эліезэраў, Ярымаў, Мататаў, Левіяў,
30 Сымонаў, Юдаў, Язэпаў, Янанаў, Эліякімаў,
31 Мэлеаяў, Маінанаў, Мататаў, Натанаў, Давідаў,
32 Есэяў, Абэдаў, Боазаў, Сальмонаў, Наасонаў,
33 Амінадабаў, Арамаў, Эсромаў, Пэрэсаў, Юдаў,
34 Якубаў, Ісаакаў, Абрагамаў, Тэрахаў, Нахораў,
35 Сэрухаў, Рагаваў, Фалекаў, Гэбэраў, Салаў,
36 Каінанаў, Арфаксадаў, Сэмаў, Нояў, Лямэхаў,
37 Мэтушаляхаў, Энохаў, Ярэдаў, Магалялеэляў, Кейнанаў,
38 Эносаў, Сэтаў, Адамаў, Божы.

Лк 4

1 Ісус, напоўнены Духам Сьвятым, вярнуўся з Ярдану і быў паведзены Духам у пустыню.
2 Там сорак дзён Ён быў спакушваны д’яблам і нічога ня еў у гэтыя дні; а калі яны скончыліся,
урэшце захацеў есьці.
3 І сказаў Яму д’ябал: «Калі Ты — Сын Божы, скажы гэтаму камяню, каб ён стаўся хлебам».
4 І адказаў яму Ісус, кажучы: «Напісана, што ня хлебам адным будзе жыць чалавек, але ўсякім
словам Божым».
5 І, узьвёўшы Яго на высокую гару, д’ябал паказаў Яму ўсе валадарствы сусьвету ў імгненьне
часу.

6 І сказаў Яму д’ябал: «Дам Табе ўладу над усім гэтым і славу іхнюю, бо яна мне аддадзена, і
я, каму хачу, даю яе.
7 Дык калі Ты паклонішся мне, усё будзе Тваё».
8 І, адказваючы, сказаў яму Ісус: «Адыйдзі ад Мяне, шатан! Бо напісана: “Госпаду, Богу твайму,
пакланяйся і Яму аднаму служы”».
9 І павёў Яго ў Ерусалім, і паставіў на самым версе сьвятыні, і сказаў Яму: «Калі Ты — Сын
Божы, кінься адгэтуль уніз,
10 бо напісана: “Анёлам Сваім загадае пра Цябе ўсьцерагчы Цябе”,
11 і: “На руках панясуць Цябе, каб не спатыкнуўся аб камень нагою Тваёю”».
12 І, адказваючы, сказаў яму Ісус: «Сказана: “Не спакушай Госпада, Бога твайго”».
13 І, скончыўшы ўсё спакушэньне, д’ябал адыйшоў ад Яго да пары.
14 І вярнуўся Ісус у сіле Духа ў Галілею; і разыйшлася чутка пра Яго па ўсёй ваколіцы.
15 І вучыў Ён у сынагогах іхніх, і ад усіх быў слаўлены.
16 І прыйшоў у Назарэт, дзе быў выхаваны, і ўвайшоў паводле звычаю Свайго ў дзень суботні
ў сынагогу, і ўстаў чытаць.
17 І далі Яму кнігу прарока Ісаі; і Ён, разгарнуўшы кнігу, знайшоў месца, дзе было напісана:
18 «Дух Госпада на Мне, бо Ён памазаў Мяне дабравесьціць убогім, паслаў Мяне аздараўляць
скрышаных сэрцам, абвяшчаць вязьням вызваленьне і сьляпым — вяртаньне зроку, пусьціць
змучаных на свабоду,
19 і абвяшчаць год Госпада прыемны».
20 І, згарнуўшы кнігу, аддаў паслугачу і сеў; і вочы ўсіх у сынагозе былі зьвернуты на Яго.
21 А Ён пачаў гаварыць ім: «Сёньня споўнілася Пісаньне гэтае, [якое] ў вушах вашых».
22 І ўсе засьведчылі Яму гэта, і зьдзіўляліся словам ласкі, якія выходзілі з вуснаў Ягоных, і
гаварылі: «Ці не Язэпаў гэта сын?»
23 І Ён сказаў ім: «Вядома, вы скажаце Мне гэткую прыповесьць: “Лекару, аздараві Самога
Сябе; зрабі і тут, у бацькаўшчыне Сваёй, тое, што, мы чулі, сталася ў Капэрнауме”».
24 І сказаў: «Сапраўды кажу вам: Ніводзін прарок не прыймаецца ў бацькаўшчыне сваёй.
25 Праўдзіва кажу вам: Шмат удоваў было ў Ізраілю ў дні Ільлі, калі было зачынена неба тры
гады і шэсьць месяцаў, так што стаўся вялікі голад па ўсёй зямлі;
26 і ані да аднае з іх ня быў пасланы Ільля, але толькі да ўдавы ў Сарэпту Сідонскую.
27 І шмат было пракажоных у Ізраілі пры прароку Элісеі, і ніводзін з іх ня быў ачышчаны,
акрамя Наамана Сірыйца».
28 І ўсе ў сынагозе напоўніліся ярасьцю, пачуўшы гэтае,
29 і, устаўшы, выгналі Яго навонкі з гораду, і павялі Яго на вяршыню гары, на якой быў
пабудаваны горад іхні, каб скінуць Яго,
30 але Ён, прайшоўшы сярод іх, пайшоў.
31 І прыйшоў у Капэрнаум, горад Галілейскі, і вучыў іх у суботы.
32 І дзівіліся з вучэньня Ягонага, бо з уладаю былі словы Ягоныя.
33 І быў у сынагозе чалавек, які меў духа дэмана нячыстага, і ён загаласіў моцным голасам,
34 кажучы: «Аёй! Што нам і Табе, Ісус Назарэец? Ты прыйшоў загубіць нас. Ведаю Цябе, хто
Ты, Сьвяты Божы».
35 І забараніў яму Ісус, кажучы: «Змоўкні і выйдзі з яго!» І, кінуўшы яго на сярэдзіну, дэман
выйшаў з яго, нічога не пашкодзіўшы яму.
36 І ахапіў усіх страх, і гутарылі між сабою, кажучы: «Што гэта за слова такое, што з уладаю і
моцаю Ён загадвае духам нячыстым, і яны выходзяць?»
37 І разыйшлася чутка пра Яго па ўсіх вакалічных месцах.
38 Выйшаўшы ж з сынагогі, Ён прыйшоў у дом Сымона. А цешча Сымонава была ў моцнай
гарачцы, і прасілі Яго за яе.
39 І, стаўшы каля яе, Ён забараніў гарачцы, і пакінула яе, а яна, адразу ўстаўшы, паслугавала
ім.

40 Пры захадзе сонца ўсе, якія мелі хворых на розныя хваробы, прыводзілі іх да Яго; і Ён,
усклаўшы на кожнага з іх рукі, аздаравіў іх.
41 Выганяў таксама з многіх дэманаў, якія крычалі і казалі: «Ты — Хрыстос, Сын Божы». І Ён
забараняў ім казаць, што яны ведаюць, што Ён — Хрыстос.
42 А калі настаў дзень, Ён, выйшаўшы, пайшоў у пустыннае месца, і натоўпы шукалі Яго, і,
прыйшоўшы да Яго, затрымлівалі Яго, каб не ішоў ад іх.
43 А Ён сказаў ім: «І ў іншых гарадах Я мушу дабравесьціць Валадарства Божае, бо дзеля гэтага
Я пасланы».
44 І абвяшчаў у сынагогах Галілейскіх.

Лк 5

1 І сталася, што натоўп ціснуўся да Яго, каб слухаць Слова Божае, і Ён стаяў каля возера
Генезарэт.
2 І ўбачыў Ён два чаўны, якія стаялі на возеры, а рыбаловы, выйшаўшы з іх, мылі сеці.
3 Увайшоўшы ў адзін човен, што быў Сымонаў, Ён прасіў яго адплыць крыху ад берагу і, сеўшы,
вучыў натоўпы з чаўна.
4 Калі ж перастаў гаварыць, сказаў Сымону: «Адплыві на глыбіню і закіньце сеці вашы дзеля
лову».
5 І, адказваючы, Сымон сказаў Яму: «Настаўнік! Мы працавалі ўсю ноч і нічога не злавілі, але
паводле слова Твайго закіну сеці».
6 І, зрабіўшы гэтае, яны злавілі вялікае мноства рыбы, і нават сетка ў іх прарывалася.
7 І далі знак таварышам, што былі на другім чаўне, каб прыйшлі дапамагчы ім, і прыйшлі, і
напоўнілі абодва чаўны, так што яны пачалі заліваццa.
8 Убачыўшы гэта, Сымон Пётар упаў да каленаў Ісуса, кажучы: «Выйдзі ад мяне, Госпадзе, бо
я — чалавек грэшны».
9 Бо страх ахапіў яго і ўсіх, што былі з ім, дзеля гэткага ўлову рыбаў, імі злоўленых,
10 таксама і Якуба і Яна, сыноў Заўдыя, якія былі супольнікамі Сымона. І сказаў Ісус Сымону:
«Ня бойся, ад цяпер будзеш лаўцом чалавекаў».
11 І, выцягнуўшы чаўны на бераг, яны пакінулі ўсё і пайшлі за Ім.
12 І сталася, Ісус быў у адным горадзе, і прыйшоў чалавек увесь у праказе, і, убачыўшы Ісуса,
упаўшы на аблічча, маліў Яго, кажучы: «Госпадзе! Калі хочаш, можаш мяне ачысьціць».
13 І Ён, працягнуўшы руку, дакрануўся да яго і сказаў: «Хачу, будзь ачышчаны». І адразу
праказа зыйшла з яго.
14 І Ён загадаў яму нікому не казаць, але пайсьці паказацца сьвятару і прынесьці ахвяру за
ачышчэньне сваё, як загадаў Майсей на сьведчаньне ім.
15 Але тым больш разыйшлося слова пра Яго, і шматлікія натоўпы зьбіраліся да Яго слухаць і
аздаравіцца ў Яго ад нядужасьцяў сваіх.
16 А Ён адыходзіў у пустынныя [месцы] і маліўся.
17 І сталася, у адзін дзень, як Ён навучаў, і сядзелі фарысэі і законавучыцелі, якія прыйшлі з
усіх мястэчак Галілеі, і Юдэі, і Ерусаліму, і сіла Госпадава была дзеля аздараўленьня іх,
18 вось, нясуць мужчыны на ложку чалавека, які быў спаралізаваны, і хацелі ўнесьці яго [ў
дом] і палажыць перад Ісусам;
19 і, не знайшоўшы, дзе пранесьці яго праз натоўп, узьлезьлі на дах і праз страху спусьцілі яго
разам з ложкам на сярэдзіну перад Ісусам.
20 І Ён, бачачы веру іх, сказаў яму: «Чалавеча! Адпускаюцца табе грахі твае».
21 І пачалі разважаць кніжнікі і фарысэі, кажучы: «Хто Ён такі, што кажа блюзьнерства? Хто
можа адпускаць грахі, акрамя аднаго Бога?»
22 А Ісус, пазнаўшы думкі іхнія, адказваючы, сказаў ім: «Што вы думаеце ў сэрцах вашых?
23 Што лягчэй сказаць: “Адпускаюцца табе грахі твае”, ці сказаць: “Устань і хадзі”?
24 Але, каб вы ведалі, што Сын Чалавечы мае ўладу на зямлі адпускаць грахі», — сказаў Ён
спаралізаванаму. — «Кажу табе: устань і, узяўшы ложак твой, ідзі ў дом твой».

25 І той, адразу ўстаўшы перад імі, узяў тое, на чым ляжаў, і пайшоў у дом свой, славячы Бога.
26 І ўсе былі ў захапленьні, і славілі Бога; і напоўніліся страхам, кажучы: «Дзіўныя рэчы бачылі мы сёньня».
27 І пасьля гэтага Ён выйшаў і ўбачыў мытніка, на імя Левій, які сядзеў на мытні, і сказаў яму: «Ідзі за Мною».
28 І той, пакінуўшы ўсё, устаў і пайшоў за Ім.
29 І зрабіў для Яго Левій у доме сваім вялікі пачастунак, і была шматлікая грамада мытнікаў і іншых, якія ўзьлягалі з імі.
30 І наракалі кніжнікі і фарысэі вучням Ягоным, кажучы: «Навошта вы ясьцё і п'яцё з мытнікамі і грэшнікамі?»
31 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Не здаровыя маюць патрэбу ў лекары, але хворыя.
32 Я прыйшоў клікаць да навяртаньня ня праведных, але грэшных».
33 А яны сказалі Яму: «Чаму вучні Яна посьцяць часта і моляцца, таксама і фарысэйскія, а Твае ядуць і п'юць?»
34 А Ён сказаў ім: «Ці можаце прымусіць сыноў вясельля посьціць, калі з імі жаніх?
35 Але прыйдуць дні, калі возьмуць у іх жаніха, і тады будуць посьціць у тыя дні».
36 І сказаў ім прыповесьць: «Ніхто латкі ад новага адзеньня не прышывае да старога адзеньня, бо іначай і новае разьдзярэ, і да старога не падыйдзе латка ад новага.
37 І ніхто не ўлівае маладога віна ў старыя мяхі, бо маладое віно прарве мяхі, і само выцячэ, і мяхі прападуць;
38 але маладое віно трэба ўліваць у новыя мяхі; і захаваецца тое і другое.
39 І ніхто, п'ючы старое віно, не захоча адразу маладога, бо кажа: "Старое лепшае"».

Лк 6

1 І сталася ў другую суботу пасьля Пасхі, што Ён праходзіў праз палеткі, і вучні Ягоныя зрывалі каласы і елі, расьціраючы [іх] рукамі.
2 А некаторыя з фарысэяў сказалі ім: «Навошта вы робіце тое, чаго ня сьлед рабіць у суботу?»
3 І, адказваючы ім, сказаў Ісус: «Ці вы не чыталі, што зрабіў Давід, калі быў галодны сам і тыя, што з ім былі?
4 Як ён увайшоў у дом Божы, і ўзяў хлябы пакладныя, якіх ня можна было есьці нікому, апрача сьвятароў, і еў, і даў тым, што з ім былі».
5 І сказаў ім: «Сын Чалавечы ёсьць Гаспадар і суботы».
6 І сталася, што ў іншую суботу ўвайшоў Ён у сынагогу і навучаў. І быў там чалавек, у якога правая рука была сухая.
7 А кніжнікі і фарысэі сачылі за Ім, ці аздаровіць у суботу, каб знайсьці абвінавачваньне супраць Яго.
8 Але Ён, ведаючы думкі іхнія, сказаў чалавеку, які меў сухую руку: «Устань і стань на сярэдзіну». І той, устаўшы, стаў.
9 Тады сказаў ім Ісус: «Спытаюся Я ў вас: "Што трэба рабіць у суботу: дабро ці зло? Збавіць душу ці загубіць?"»
10 І, паглядзеўшы на ўсіх іх, сказаў чалавеку: «Выцягні руку тваю». Ён так і зрабіў, і сталася рука ягоная здаровая, як другая.
11 А яны напоўніліся шалам і гаварылі адзін да аднаго, што ім зрабіць з Ісусам.
12 І сталася ў тыя дні, узыйшоў Ён на гару памаліцца, і быў усю ноч у малітве да Бога.
13 І калі настаў дзень, Ён паклікаў вучняў Сваіх і выбраў з іх дванаццаць, якіх і назваў апосталамі:
14 Сымона, якога назваў Пятром, і Андрэя, брата ягонага, Якуба і Яна, Філіпа і Барталамея,
15 Мацьвея і Тамаша, Якуба Алфеявага і Сымона, называнага Зілотам,
16 Юду Якубавага і Юду Іскарыёта, які стаўся здраднікам.
17 І, зыйшоўшы разам з імі, стаў на роўным месцы, і натоўп вучняў Ягоных, і вялікае мноства народу з усёй Юдэі, і Ерусаліму, і прыморскіх гарадоў Тыру і Сідону,

18 якія прыйшлі паслухаць Яго і аздаравіцца ад хваробаў сваіх. І тыя, якіх мучылі духі
нячыстыя, былі аздароўленыя.
19 І ўвесь натоўп шукаў дакрануцца да Яго, бо ад Яго зыходзіла моц і аздараўляла ўсіх.
20 І Ён, падняўшы вочы Свае на вучняў Сваіх, сказаў: «Шчасьлівыя ўбогія, бо вашае ёсьць
Валадарства Божае.
21 Шчасьлівыя вы, якія цяпер галодныя, бо вы насыціцеся. Шчасьлівыя вы, якія цяпер плачаце,
бо будзеце сьмяяцца.
22 Шчасьлівыя вы, калі зьненавідзяць вас людзі і калі адлучаць вас, і будуць зьневажаць, і
выкінуць імя вашае, як зло, за Сына Чалавечага.
23 Радуйцеся ў той дзень і весяліцеся, бо вось, вялікая нагарода вашая ў небе, бо гэтак рабілі з
прарокамі бацькі іхнія.
24 Больш таго, гора вам, багатыя, бо вы ўжо атрымліваеце пацяшэньне сваё.
25 Гора вам, перасычаныя, бо будзеце галодныя. Гора вам, якія цяпер сьмеяцёся, бо будзеце
плакаць і галасіць.
26 Гора вам, калі ўсе людзі будуць гаварыць пра вас добра, бо гэтак рабілі з фальшывымі
прарокамі бацькі іхнія.
27 Але вам, якія слухаеце, кажу: Любіце ворагаў вашых, рабіце дабро тым, якія ненавідзяць
вас,
28 дабраслаўляйце тых, якія праклінаюць вас, і маліцеся за тых, якія крыўдзяць вас.
29 І таму, які ўдарыў цябе па шчацэ, падстаў і другую; і таму, хто забірае ў цябе адзеньне, не
перашкаджай узяць і кашулю.
30 Усякаму, хто просіць у цябе, давай; і ад таго, хто ўзяў у цябе, не патрабуй назад.
31 І як хочаце, каб рабілі вам людзі, гэтак і вы рабіце ім.
32 І калі вы любіце тых, якія вас любяць, якая вам падзяка? Бо і грэшнікі любяць тых, якія іх
любяць.
33 І калі робіце дабро тым, якія вам дабро робяць, якая вам падзяка? Бо і грэшнікі тое робяць.
34 І калі пазычаеце тым, ад якіх спадзеяцёся атрымаць назад, якая вам падзяка? Бо і грэшнікі
пазычаюць грэшнікам, каб атрымаць назад гэтулькі.
35 Больш таго, любіце ворагаў вашых, і рабіце дабро, і пазычайце, не чакаючы нічога; і будзе
нагарода вашая вялікая, і будзеце сынамі Найвышэйшага, бо Ён добры і да няўдзячных і злых.
36 Дык будзьце ж міласэрныя, як і Айцец ваш міласэрны.
37 І не судзіце, і ня будзеце суджаныя; не асуджайце, і ня будзеце асуджаныя; даруйце, і вам
будзе даравана;
38 давайце, і вам будзе дадзена: меру добрую, націсьненую, стрэсеную і з верхам дадуць вам
на ўлоньне вашае; бо якою мераю мераеце, такою і вам будзе адмерана».
39 Сказаў жа ім прыповесьць: «Ці можа сьляпы вадзіць сьляпога? Ці не абодва ўваляцца ў яму?
40 Вучань не вышэй за настаўніка свайго, але, удасканаліўшыся, кожны будзе як настаўнік
ягоны.
41 Што ты глядзіш на сучок у воку брата твайго, а бервяна ў воку тваім ня бачыш?
42 Ці як можаш сказаць брату твайму: “Браце! Дазволь, выму сучок з вока твайго”, — калі сам
ня бачыш бервяна ў воку сваім? Крывадушнік! Вымі спачатку бервяно з вока свайго, і тады
ўбачыш, як выняць сучок, які ў воку брата твайго.
43 Бо няма добрага дрэва, якое прыносіць благі плод; і няма благога дрэва, якое прыносіць
плод добры.
44 Бо ўсякае дрэва пазнаецца з уласнага плоду; бо не зьбіраюць фігаў з цярніны і ня здымаюць
вінаграду з глогу.
45 Добры чалавек з добрага скарбу сэрца свайго выносіць добрае, а злы чалавек са злога скарбу
сэрца свайго выносіць злое; бо з багацьця сэрца гавораць вусны ягоныя.
46 Чаму называеце Мяне: “Госпадзе! Госпадзе!” — і ня робіце таго, што Я кажу?
47 Усякі, хто прыходзіць да Мяне, і слухае словы Мае, і робіць паводле іх, пакажу вам, да каго
падобны.

48 Ён падобны да чалавека, што будуе дом, і ён капаў, і заглыбіўся, і заклаў падмурак на скале,
і калі сталася паводка, і вада ўдарыла на дом гэты, то не змагла захістаць яго, бо ён быў
пабудаваны на скале.
49 А той, хто слухае і ня робіць, падобны да чалавека, што пабудаваў дом на зямлі без
падмурку, які, калі ўдарыла на яго вада, адразу разваліўся; і разбурэньне яго было вялікае».

Лк 7

1 Калі ж Ён скончыў [гаварыць] усе словы Свае ў вушы народу, увайшоў у Капэрнаум.
2 У аднаго ж сотніка слуга, якога той цаніў, быў хворы пры сьмерці.
3 Пачуўшы пра Ісуса, ён паслаў да Яго старшыняў Юдэйскіх прасіць Яго, каб прыйшоў
аздаравіць слугу ягонага.
4 І яны, прыйшоўшы да Ісуса, дужа прасілі Яго, кажучы: «Ён варты, каб Ты зрабіў для яго гэтае,
5 бо ён любіць народ наш і пабудаваў нам сынагогу».
6 Ісус пайшоў з імі. А калі Ён быў ужо недалёка ад дому, сотнік прыслаў да Яго сяброў сказаць
Яму: “Не турбуйся, Госпадзе! Бо я ня варты, каб Ты ўвайшоў пад дах мой,
7 бо і сябе самога я не палічыў вартым прыйсьці да Цябе. Але скажы слова, і будзе аздароўлены
слуга мой.
8 Бо і я чалавек, які маю над сабою ўладу, і маю пад сабою жаўнераў; і кажу аднаму: “Пайдзі”,
— і ён ідзе; і другому: “Прыйдзі”, — і ён прыходзіць; і слузе майму: “Зрабі тое”, — і ён робіць».
9 Пачуўшы гэтае, Ісус зьдзівіўся з яго і, павярнуўшыся, сказаў натоўпу, які ішоў за Ім: «Кажу
вам, што нават у Ізраілю не знайшоў Я гэткае веры».
10 І вярнуўшыся ў дом, пасланыя знайшлі хворага слугу паздаравеўшым.
11 І сталася пасьля гэтага, пайшоў Ён у горад, называны Наін; і з Ім ішлі многія з вучняў Ягоных
і шматлікі натоўп.
12 Калі ж Ён наблізіўся да брамы гораду, вось, выносілі памёршага, адзінароднага сына ў маці
сваёй, а яна была ўдава; і вялікі натоўп з гораду ішоў з ёю.
13 І, убачыўшы яе, Госпад зьлітаваўся над ёю і сказаў ёй: «Ня плач».
14 І, падыйшоўшы, дакрануўся да пахавальных насілак; а тыя, што несьлі іх, затрымаліся, і Ён
сказаў: «Юнача, табе кажу: "Устань!"»
15 І сеў мёртвы, і пачаў гаварыць; і Ён аддаў яго маці ягонай.
16 І ўсіх ахапіў страх, і яны славілі Бога, кажучы: «Вялікі прарок паўстаў між намі», і: «Бог
адведаў народ Свой».
17 І разыйшлося слова гэтае пра Яго па ўсёй Юдэі і па ўсёй ваколіцы.
18 І паведамілі Яну вучні ягоныя пра ўсё гэтае.
19 І, паклікаўшы двух з вучняў сваіх, Ян паслаў іх да Ісуса, кажучы: «Ці Ты Той, Які прыходзіць,
ці чакаць нам іншага?»
20 А мужы [гэтыя], прыйшоўшы да Яго, сказалі: «Ян Хрысьціцель паслаў нас да Цябе, кажучы:
“Ці Ты Той, Які прыходзіць, ці чакаць нам іншага?”»
21 У гэтую гадзіну Ён многіх аздаравіў ад хваробаў і немачаў, і ад злых духаў, і многім сьляпым
вярнуў зрок.
22 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Пайдзіце, паведаміце Яну, што вы бачылі і чулі, што сьляпыя
бачаць, кульгавыя ходзяць, пракажоныя ачышчаюцца, глухія чуюць, мёртвыя ўваскрасаюць,
убогім дабравесьціцца.
23 І шчасьлівы той, хто ня згоршыцца праз Мяне».
24 Калі ж пасланцы Яна пайшлі, Ён пачаў гаварыць да натоўпаў пра Яна: «Што глядзець хадзілі
вы ў пустыню? Ці трысьціну, якую вецер хістае?
25 Але што хадзілі вы ўбачыць? Ці чалавека, апранутага ў мяккія шаты? Вось, тыя, што ў
пышным адзеньні і жывуць раскошна, знаходзяцца пры дварох валадарскіх.
26 Але што хадзілі вы ўбачыць? Прарока? Так, кажу вам, і больш за прарока.
27 Ён ёсьць той, пра якога напісана: “Вось, Я пасылаю анёла Майго перад абліччам Тваім, які
пракладзе шлях Твой перад Табою”.

28 Бо кажу вам: "Сярод народжаных жанчынамі няма ніводнага прарока, большага за Яна
Хрысьціцеля; але меншы ў Валадарстве Божым большы за яго".
29 І ўвесь народ, які слухаў яго, і мытнікі аддалі хвалу Богу, хрысьцячыся хрышчэньнем
Янавым;
30 а фарысэі і законьнікі адкінулі параду Божую для іх, не ахрысьціўшыся ў яго».
31 Госпад жа сказаў: «З кім параўнаю людзей пакаленьня гэтага? І да каго яны падобныя?
32 Яны падобныя да дзяцей, якія сядзяць на вуліцы, і клічуць адзін аднаго, і кажуць: “Мы гралі
вам на жалейцы, і вы не скакалі; мы галасілі, і вы ня плакалі”.
33 Бо прыйшоў Ян Хрысьціцель, ані хлеба ня есьць, ані віна ня п’е, і вы кажаце: “Дэмана мае”.
34 Прыйшоў Сын Чалавечы, есьць і п’е, і вы кажаце: “Вось, чалавек — абжора і п’яніца, сябра
мытнікаў і грэшнікаў”.
35 І апраўдана мудрасьць усімі дзецьмі яе».
36 Нехта з фарысэяў прасіў Яго паесьці разам з ім, і Ён, увайшоўшы ў дом фарысэя, узьлёг.
37 І вось жанчына з таго гораду, якая была грэшніцай, даведаўшыся, што Ён узьлягае ў доме
фарысэя, прынесла алябастравы збанок міра,
38 і, стаўшы ззаду каля ног Ягоных і плачучы, пачала абліваць ногі Ягоныя сьлязьмі, і выцірала
валасамі галавы сваёй, і цалавала ногі Ягоныя, і мазала мірам.
39 Бачачы гэтае, фарысэй, які быў запрасіў Яго, сказаў сам у сабе: «Калі б Ён быў прарок, дык
ведаў бы, хто і якая жанчына дакранаецца да Яго, бо яна — грэшніца».
40 І, адказваючы, Ісус сказаў яму: «Сымоне, Я маю нешта сказаць табе». Ён жа кажа: «Кажы,
Настаўнік».
41 [Ісус сказаў]: «У аднаго пазычальніка былі два даўжнікі: адзін быў вінен пяцьсот дынараў,
а другі — пяцьдзясят.
42 А як яны ня мелі, чым заплаціць, ён дараваў абодвум. Скажы, каторы з іх больш узьлюбіць
яго?»
43 Адказваючы, Сымон сказаў: «Думаю, што той, якому больш дараваў». Ён жа сказаў яму:
«Слушна ты пастанавіў».
44 І, павярнуўшыся да жанчыны, сказаў Сымону: «Ці бачыш ты гэтую жанчыну? Я прыйшоў у
дом твой, і ты вады Мне на ногі ня даў; а яна сьлязьмі абліла ногі Мае і валасамі галавы сваёй
выцерла.
45 Ты пацалунку Мне ня даў, а яна, як толькі Я прыйшоў, не перастае цалаваць ногі Мае.
46 Ты галавы Мне алеем не памазаў; а яна мірам памазала ногі Мае.
47 Дзеля гэтага кажу табе: даруюцца многія грахі яе за тое, што яна шмат узьлюбіла; а каму
мала даруецца, той мала любіць».
48 А ёй сказаў: «Адпускаюцца табе грахі».
49 І тыя, што ўзьлягалі з Ім, пачалі гаварыць у сабе: «Хто Ён ёсьць, што і грахі адпускае?»
50 А Ён сказаў жанчыне: «Вера твая збавіла цябе; ідзі ў супакоі».

Лк 8

1 І сталася пасьля, праходзіў Ён праз гарады і мястэчкі, абвяшчаючы і дабравесьцячы
Валадарства Божае, і з Ім Дванаццаць,
2 і некаторыя жанчыны, якія былі аздароўленыя ад злых духаў і нядужасьцяў: Марыя,
называная Магдалена, з якое выйшлі сем дэманаў,
3 і Ёанна, жонка Хузы, наглядчыка Ірадавага, і Сусанна, і многія іншыя, якія служылі Яму з
маёмасьці сваёй.
4 А калі сабралася мноства народу, і з гарадоў зыходзіліся да Яго, Ён пачаў гаварыць
прыповесьць:
5 «Выйшаў сейбіт сеяць насеньне сваё; і, калі ён сеяў, адно ўпала пры дарозе і было патаптана,
і птушкі нябесныя падзяўблі яго;
6 а іншае ўпала на камень і, узыйшоўшы, засохла, бо ня мела вільгаці;
7 а іншае ўпала між цярнінаю, і вырасла цярніна, і заглушыла яго;

8 а іншае ўпала на добрую зямлю і, узыйшоўшы, прынесла плод стакротны». Сказаўшы гэтае,
Ён усклікнуў: «Хто мае вушы слухаць, няхай слухае».
9 А вучні Ягоныя пыталіся ў Яго, кажучы: «Што значыць прыповесьць гэтая?»
10 Ён жа сказаў: «Вам дадзена ведаць таямніцы Валадарства Божага, а для рэшты яны ў
прыповесьцях, так што яны, бачачы, ня бачаць і, чуючы, не разумеюць.
11 Вось жа прыповесьць гэтая: насеньне ёсьць слова Божае.
12 А што пры дарозе — гэта тыя, якія слухаюць, а пасьля прыходзіць д'ябал, і забірае слова з
сэрца іхняга, каб не паверылі і не былі збаўленыя.
13 А што на камяні — гэта тыя, якія, калі пачуюць, з радасьцю прыймаюць слова, ды ня маюць
кораня і часова вераць, а ў час спакусы адпадаюць.
14 А што ўпала ў цярніну — гэта тыя, якія слухаюць, але, адыходзячы, заглушаюцца клопатамі,
багацьцем і асалодамі жыцьцёвымі, і не даюць плоду.
15 А што ўпала на добрую зямлю — гэта тыя, што, пачуўшы слова, захоўваюць у добрым і
чыстым сэрцы, і даюць плод у цярплівасьці.
16 Ніхто, запаліўшы сьвечку, не прыкрывае яе пасудзінаю, або ня ставіць пад ложак, але ставіць
на сьвечнік, каб тыя, якія ўваходзяць, бачылі сьвятло.
17 Бо няма нічога таемнага, што б ня выявілася, ані схаванага, што ня сталася б вядомым і ня
выйшла на сьвятло.
18 Дык глядзіце, як вы слухаеце; бо хто мае, таму дадзена будзе, а хто ня мае, у таго будзе
забрана і тое, што ён думае мець».
19 І прыйшлі да Яго маці і браты Ягоныя, і не маглі падыйсьці да Яго з прычыны натоўпу.
20 І паведамілі Яму, кажучы: «Маці Твая і браты Твае стаяць вонкі, хочучы бачыць Цябе».
21 Ён жа, адказваючы, сказаў ім: «Маці Мая і браты Мае — гэта тыя, якія слухаюць слова Божае
і выконваюць яго».
22 І сталася аднаго дня, Ён увайшоў з вучнямі Сваімі ў човен і сказаў ім: «Пераплывем на той
бок возера». І паплылі.
23 Калі ж яны плылі, Ён заснуў. І падняўся на возеры бурны вецер, і іх залівала хвалямі, і яны
былі ў небясьпецы.
24 І, падыйшоўшы, яны пабудзілі Яго, кажучы: «Настаўнік! Настаўнік! Мы гінем». А Ён,
устаўшы, забараніў ветру і хваляваньню вады; і яны спыніліся, і сталася ціша.
25 Ён жа сказаў ім: «Дзе вера вашая?» А яны, спалохаўшыся, у зьдзіўленьні гаварылі адзін
аднаму: «Хто Ён ёсьць, што вятрам загадвае і вадзе, і яны падпарадкоўваюцца Яму?»
26 І прыплылі ў краіну Гадарэнскую, якая насупраць Галілеі.
27 Калі ж выйшаў Ён на бераг, пераняў Яго нейкі чалавек з гораду, які меў дэманаў з даўніх
часоў, і не апранаў адзеньня, і жыў ня ў доме, але ў магілах.
28 Ён, убачыўшы Ісуса, упаў перад Ім, закрычаўшы, і моцным голасам сказаў: «Што мне і Табе,
Ісус, Сын Бога Найвышэйшага? Малю Цябе, ня мучай мяне».
29 Бо Ён загадаў духу нячыстаму выйсьці з гэтага чалавека; бо ён доўгі час мучыў яго, так што
яго вязалі ланцугамі і сьцераглі яго, але ён разрываў ланцугі, і дэман гнаў яго ў пустыні.
30 А Ісус спытаўся ў яго, кажучы: «Якое тваё імя?» Ён жа сказаў: «Легіён», бо шмат дэманаў
увайшло ў яго.
31 І прасілі Яго, каб не казаў ім ісьці ў бездань.
32 А там на гары пасьвіўся вялікі гурт сьвіньняў; і прасілі Яго [дэманы], каб дазволіў ім
увайсьці ў іх, і Ён дазволіў ім.
33 Дэманы, выйшаўшы з чалавека, увайшлі ў сьвіньняў, і рынуўся гурт са стромы ў возера, і
згінуў.
34 А тыя, якія пасьвілі іх, убачыўшы, што сталася, уцяклі і, пайшоўшы, паведамілі ў горадзе і
вёсках.
35 І выйшлі ўбачыць, што сталася; і прыйшлі да Ісуса, і знайшлі чалавека, з якога выйшлі
дэманы, што сядзіць каля ног Ісуса, апрануты і пры розуме; і спалохаліся.
36 А тыя, якія бачылі, распавялі ім, як збаўлены быў апанаваны дэманамі.

37 І прасіла Яго ўсё мноства ваколіцы Гадарэнскае пайсьці ад іх, бо іх ахапіў вялікі страх. Ён
жа, увайшоўшы ў човен, вярнуўся.
38 А чалавек, з якога выйшлі дэманы, прасіў Яго, каб быць з Ім, але Ісус адпусьціў яго, кажучы:
39 «Вярніся ў дом твой і раскажы, што ўчыніў табе Бог». І ён пайшоў, абвяшчаючы па ўсім
горадзе, што ўчыніў яму Ісус.
40 І сталася, калі Ісус вярнуўся, натоўп прыняў Яго, бо ўсе чакалі Яго.
41 І вось прыйшоў чалавек на імя Яір, а быў ён начальнік сынагогі; і, упаўшы да ног Ісуса, прасіў
Яго ўвайсьці ў дом ягоны,
42 бо ў яго была адзінародная дачка, гадоў дванаццаці, і яна паміра́ла. А калі Ён ішоў, натоўпы
ціснуліся да Яго
43 І жанчына, якая мела крывацечу дванаццаць гадоў і аддала на лекараў усё ўтрыманьне сваё,
і ніводзін ня здолеў вылечыць яе,
44 падыйшоўшы ззаду, дакранулася да крыса шаты Ягонай; і адразу спынілася ў яе крывацеча.
45 І сказаў Ісус: «Хто дакрануўся да Мяне?» А як усе адмаўляліся, сказаў Пётар і тыя, што
з Ім былі: «Настаўнік! Натоўпы акружаюць Цябе і ціснуць, і Ты кажаш: “Хто дакрануўся да
Мяне?”»
46 Але Ісус сказаў: «Нехта дакрануўся да Мяне, бо Я адчуў сілу, якая выйшла з Мяне».
47 А жанчына, бачачы, што яна ня ўтоілася, дрыжучы, падыйшла і, упаўшы перад Ім,
расказала Яму перад усім народам, з якое прычыны яна дакранулася да Яго, і як адразу была
аздароўлена.
48 Ён жа сказаў ёй: «Будзь пэўная, дачка! Вера твая збавіла цябе; ідзі ў супакоі».
49 Калі Ён яшчэ гаварыў гэтае, прыходзіць нехта ад начальніка сынагогі, кажучы яму: «Дачка
твая памерла; не турбуй Настаўніка».
50 А Ісус, пачуўшы, адказаў яму, кажучы: «Ня бойся, толькі вер, і будзе збаўлена».
51 Прыйшоўшы ж у дом, не дазволіў увайсьці нікому апрача Пятра, Яна і Якуба, і бацькі
дзяўчынкі, і маці.
52 А ўсе плакалі і галасілі па ёй. Ён жа сказаў: «Ня плачце; яна не памерла, але сьпіць».
53 І сьмяяліся з Яго, ведаючы, што яна памерла.
54 Ён жа, выслаўшы ўсіх вонкі і ўзяўшы яе за руку, усклікнуў, кажучы: «Дзяўчынка, устань!»
55 І вярнуўся дух ейны, і яна адразу ўстала, і Ён загадаў даць ёй есьці.
56 І зьдзівіліся бацькі ейныя, а Ён загадаў ім не гаварыць нікому пра тое, што сталася.

Лк 9

1 Паклікаўшы ж дванаццаць вучняў Сваіх, Ён даў ім моц і ўладу над усімі дэманамі і
аздараўляць хваробы.
2 І паслаў іх абвяшчаць Валадарства Божае і аздараўляць нядужых.
3 І сказаў ім: «Нічога не бярыце ў дарогу: ані кія, ані торбы, ані хлеба, ані срэбра, і каб двух
вопратак ня мелі.
4 І ў які дом увойдзеце, там заставайцеся, і адтуль выпраўляйцеся;
5 і калі дзе ня прыймуць вас, то, выходзячы з таго гораду, абтрасіце і пыл з ног вашых у
сьведчаньне супраць іх».
6 Пайшоўшы, яны праходзілі праз мястэчкі, дабравесьцячы і аздараўляючы паўсюль.
7 А тэтрарх Ірад пачуў пра ўсё, што дзеялася праз Яго, і быў зьбянтэжаны, бо адны казалі, што
гэта Ян устаў з мёртвых;
8 а другія — што Ільля зьявіўся, а іншыя — што адзін са старадаўніх прарокаў уваскрос.
9 І сказаў Ірад: «Яна я сьцяў. А хто Гэты, пра Якога я чую такое?» І шукаў убачыць Яго.
10 І вярнуўшыся, апосталы расказалі Яму, што яны зрабілі, і Ён, узяўшы іх, пайшоў асобна ў
пустыннае месца каля гораду, называнага Бэтсаіда.
11 Але народ, даведаўшыся, пайшоў за Ім; і Ён, прыняўшы іх, гаварыў з імі пра Валадарства
Божае, і тых, якія мелі патрэбу ў аздараўленьні, аздараўляў.

12 Калі ж дзень пачаў зыходзіць, прыступіўшы да Яго, Дванаццаць сказалі Яму: «Адпусьці
натоўп, каб яны, пайшоўшы ў навакольныя мястэчкі і вёскі, пераначавалі і знайшлі ежу, бо
мы тут у пустынным месцы».
13 Ён жа сказаў ім: «Вы дайце ім есьці». А яны сказалі: «У нас няма больш за пяць хлябоў і
дзьве рыбы. Хіба што мы, пайшоўшы, купім ежы для ўсіх гэтых людзей?»
14 Бо іх было пяць тысячаў чалавек. Але Ён сказаў вучням Сваім: «Рассадзіце іх шэрагамі па
пяцьдзясят».
15 І зрабілі так, і рассадзілі ўсіх.
16 Ён жа, узяўшы пяць хлябоў і дзьве рыбы і зірнуўшы ў неба, дабраславіў іх, паламаў і даў
вучням, каб раздалі натоўпу.
17 І елі, і насыціліся ўсе; і назьбіралі пазасталых кавалкаў дванаццаць кашоў.
18 І сталася, калі Ён маліўся асобна, вучні былі з Ім, і Ён спытаўся ў іх, кажучы: «Кім называе
Мяне натоўп?»
19 Яны, адказваючы, сказалі: «Янам Хрысьціцелем, а іншыя — Ільлём; а іншыя — што адзін са
старадаўных прарокаў уваскрос».
20 Ён жа сказаў ім: «А вы кім называеце Мяне?» Адказваючы, Пётар сказаў: «Хрыстом Божым».
21 Але Ён строга загадаў ім нікому не гаварыць пра гэта,
22 сказаўшы, што Сын Чалавечы мусіць шмат перацярпець, і быць адкінутым старшынямі, і
першасьвятарамі, і кніжнікамі, і будзе забіты, і на трэці дзень уваскрэсьне.
23 Да ўсіх жа сказаў: «Калі хто хоча ісьці за Мною, няхай адрачэцца ад самога сябе, і бярэ крыж
свой штодзень, і ідзе за Мною.
24 Бо хто хоча збавіць душу сваю, загубіць яе; а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне, той збавіць
яе.
25 Бо якая карысьць чалавеку здабыць увесь сьвет, а сябе самога загубіць, ці пашкодзіць сабе?
26 Бо хто пасаромеецца Мяне і словаў Маіх, таго Сын Чалавечы пасаромеецца, калі прыйдзе ў
славе Сваёй, і Айца, і сьвятых анёлаў.
27 Кажу вам праўдзіва, ёсьць некаторыя з тых, што тут стаяць, якія не пакаштуюць сьмерці,
пакуль ня ўбачаць Валадарства Божага».
28 І сталася праз восем дзён пасьля словаў гэтых, узяўшы Пятра, Яна і Якуба, Ён узыйшоў на
гару маліцца.
29 І калі Ён маліўся, стаўся выгляд аблічча Ягонага іншым, і адзеньне Ягонае сталася белым,
бліскучым.
30 І вось, два мужы гутарылі з Ім, а былі гэта Майсей і Ільля,
31 якія, зьявіўшыся ў славе, гаварылі пра зыход Ягоны, што Ён меўся споўніць у Ерусаліме.
32 Пётар жа і тыя, што з ім, былі ахопленыя сном; а прачнуўшыся, убачылі славу Ягоную і двух
мужоў, якія стаялі з Ім.
33 І сталася, калі тыя адыходзілі ад Яго, сказаў Пётар Ісусу: «Настаўнік! Добра нам тут быць.
Зробім тры намёты: адзін — Табе, адзін — Майсею, і адзін — Ільлі», — ня ведаючы, што кажа.
34 Калі ж ён гаварыў гэтае, зьявілася воблака і агарнула іх; і яны перепалохаліся, калі ўвайшлі
ў воблака.
35 І стаўся голас з воблака, які казаў: «Гэта ёсьць Сын Мой улюбёны; Яго слухайце».
36 І калі быў голас гэты, застаўся Ісус адзін. І яны замаўчалі, і нікому не абвясьцілі ў тыя дні,
што бачылі.
37 І сталася на наступны дзень, як яны зыйшлі з гары, сустрэў Яго вялікі натоўп.
38 І вось нейкі чалавек з натоўпу крыкнуў, кажучы: «Настаўнік! Малю Цябе, глянь на сына
майго, бо ён адзінародны ў мяне.
39 І вось дух бярэ яго, і ён неспадзявана крычыць, і тузае яго з пенай; і ледзь адступае ад яго,
разьбіўшы яго.
40 І я прасіў вучняў Тваіх выгнаць яго, і яны не змаглі».
41 Ісус жа, адказваючы, сказаў: «О, пакаленьне бязьвернае і сапсаванае! Дакуль буду з вамі і
буду цярпець вас? Прывядзі сюды сына твайго».

42 Калі ж той падыходзіў, дэман кінуў яго і затрос; але Ісус забараніў духу нячыстаму, і
аздаравіў хлопца, і аддаў яго бацьку ягонаму.
43 І ўсе дзівіліся велічы Божай. Калі ж усе дзівіліся ўсяму, што ўчыніў Ісус, Ён сказаў вучням
Сваім:
44 «Палажыце ў вушы свае словы гэтыя: Сын Чалавечы мае быць выдадзены ў рукі чалавечыя».
45 Але яны не зразумелі слова гэтага, і яно было закрытае ад іх, каб яны ўцяміць яго; а спытацца
ў Яго пра слова гэтае яны баяліся.
46 Прыйшла ж ім думка, хто з іх быў бы большы?
47 А Ісус, убачыўшы думкі сэрца іхняга, узяўшы дзіця, паставіў яго перад Сабою
48 і сказаў ім: «Хто прыйме гэтае дзіця ў імя Маё, Мяне прыймае, а хто Мяне прыйме, прыймае
Таго, Які паслаў Мяне. Бо хто з вас меншы за ўсіх, той будзе вялікі».
49 Адказваючы, Ян сказаў: «Настаўнік! Мы бачылі [чалавека], які ў імя Тваё выганяў дэманаў,
і забаранілі яму, бо ён ня ходзіць з намі».
50 І сказаў яму Ісус: «Не забараняйце, бо хто ня супраць вас, той за вас».
51 І сталася, калі набліжаліся дні ўзяцьця Яго, Ён зьвярнуў аблічча Сваё ісьці ў Ерусалім
52 і паслаў весьнікаў перад абліччам Сваім. І яны, пайшоўшы, увайшлі ў мястэчка
Самаранскае, каб падрыхтаваць [месца] для Яго,
53 але там не прынялі Яго, бо аблічча Ягонае было скіраванае ў Ерусалім.
54 Убачыўшы гэта, вучні Ягоныя Якуб і Ян сказалі: «Госпадзе! Ці хочаш, мы скажам, каб агонь
зыйшоў з неба і зьнішчыў іх, як і Ільля зрабіў?»
55 Але Ён, павярнуўшыся да іх, забараніў ім і сказаў: «Ня ведаеце, якога вы духа,
56 бо Сын Чалавечы прыйшоў не загубіць душы чалавечыя, але збавіць». І пайшлі ў другое
мястэчка.
57 І сталася, калі яны былі ў дарозе, нехта сказаў Яму: «Я пайду за Табою, куды б Ты ні пайшоў,
Госпадзе!»
58 І сказаў яму Ісус: «Лісы маюць норы, і птушкі нябесныя — гнёзды, а Сын Чалавечы ня мае,
дзе галаву прыхіліць».
59 А другому сказаў: «Ідзі за Мною». Той сказаў: «Госпадзе! Дазволь мне, адыйшоўшы, перш
пахаваць бацьку майго».
60 Але Ісус сказаў яму: «Пакінь мёртвым хаваць мёртвых сваіх, а ты ідзі і абвяшчай
Валадарства Божае».
61 І другі сказаў: «Я пайду за Табою, Госпадзе! Але перш дазволь мне разьвітацца з хатнімі
маімі».
62 Але Ісус сказаў яму: «Той, хто ўзлажыў руку сваю на плуг і аглядаецца назад, не надаецца
да Валадарства Божага».

Лк 10

1 Пасьля гэтага прызначыў Госпад іншых семдзясят і паслаў іх па двое перад абліччам Сваім у
кожны горад і месца, куды Сам меўся ісьці.
2 Тады сказаў ім: «Сапраўды, жніво багатае, а работнікаў мала. Дык прасіце Гаспадара жніва,
каб выслаў работнікаў на жніво Сваё.
3 Ідзіце! Вось, Я пасылаю вас, як ягнят сярод ваўкоў.
4 Не бярыце ані кайстры, ані торбы, ані сандалаў, і нікога ў дарозе не вітайце.
5 У які ж дом увойдзеце, перш кажыце: “Супакой дому гэтаму!”
6 І калі будзе там сын супакою, то супачыне на ім супакой ваш, а калі не, то да вас вернецца.
7 А ў доме тым заставайцеся, ешце і піце, што ў іх ёсьць; бо работнік варты платы сваёй. Не
пераходзьце з дому ў дом.
8 І калі прыйдзеце ў які горад, і прыймуць вас, ешце, што вам дадуць;
9 і аздараўляйце ў іх хворых, і кажыце ім: “Наблізілася да вас Валадарства Божае”.
10 А калі прыйдзеце ў які горад, і ня прыймуць вас, то, выйшаўшы на вуліцу, скажыце:
11 “І пыл, які прыліп да нас ад вашага гораду, абтрасаем вам. Аднак жа ведайце, што
наблізілася да вас Валадарства Божае”.

12 Кажу ж вам, што Садому ў дзень той лягчэй будзе, чым гораду гэткаму.
13 Гора табе, Харазін! Гора табе, Бэтсаіда! Бо калі б у Тыры і Сідоне сталіся цуды, якія былі
стаўшыся ў вас, яны даўно б навярнуліся, седзячы ў зрэбніцы і попеле.
14 Але Тыру і Сідону лягчэй будзе на судзе, чым вам.
15 І ты, Капэрнаум, які да неба ўзьнёсся, у пекла скінуты будзеш.
16 Хто слухае вас, той Мяне слухае, і хто адкідае вас, той Мяне адкідае. А хто адкідае Мяне, той
адкідае і Таго, Хто паслаў Мяне».
17 А семдзясят вярнуліся з радасьцю, кажучы: «Госпадзе! І дэманы падпарадкоўваюцца нам у
імя Тваё».
18 Ён жа сказаў ім: «Я бачыў шатана, які ўпаў з неба, як бліскавіца.
19 Вось, Я даю вам уладу наступаць на зьмеяў і скарпіёнаў, і на ўсю сілу варожую, і нішто не
пашкодзіць вам.
20 Аднак жа з таго ня радуйцеся, што духі вам падпарадкоўваюцца; але радуйцеся з таго, што
імёны вашыя запісаны ў небе».
21 У тую гадзіну ўзрадаваўся Ісус у духу і сказаў: «Вызнаю Цябе, Ойча, Госпадзе неба і зямлі,
што Ты схаваў гэтае ад мудрых і разумных, і адкрыў немаўлятам. Так, Айцец, бо гэтак было
даспадобы Табе».
22 І, павярнуўшыся да вучняў, сказаў: «Усё Мне аддадзена Айцом Маім; і Хто ёсьць Сын, ня
ведае ніхто, акрамя Айца, і Хто ёсьць Айцец, ня ведае ніхто, акрамя Сына і каму Сын хоча
адкрыць».
23 І, павярнуўшыся да вучняў, сказаў ім асобна: «Шчасьлівыя вочы, якія бачаць тое, што вы
бачыце!
24 Бо кажу вам, што многія прарокі і валадары хацелі бачыць тое, што вы бачыце, і ня бачылі;
і пачуць тое, што вы чуеце, і ня чулі».
25 І вось, нейкі законьнік устаў, спакушаючы Яго і кажучы: «Настаўнік! Што мне рабіць, каб
успадкаеміць жыцьцё вечнае?»
26 Ён жа сказаў яму: «У Законе што напісана? Як чытаеш?»
27 Ён жа, адказваючы, сказаў: «Любі Госпада, Бога твайго, усім сэрцам тваім, і ўсёю душою
тваёю, і ўсёю моцаю тваёю, і ўсім разуменьнем тваім, і бліжняга твайго, як самога сябе».
28 [Ісус] сказаў яму: «Слушна ты адказаў. Рабі гэтак, і будзеш жыць»
29 Але ён, хочучы апраўдацца, сказаў Ісусу: «А хто мой бліжні?»
30 На гэтае сказаў Ісус: «Нейкі чалавек зыходзіў з Ерусаліму ў Ерыхон і натрапіў на
разбойнікаў, якія зьнялі з яго вопратку, зьбілі яго і пайшлі, пакінуўшы яго ледзь жывога.
31 Здарылася, што нейкі сьвятар зыходзіў гэтай дарогаю і, убачыўшы яго, прамінуў яго.
32 Таксама і лявіт, апынуўшыся на тым месцы, падыйшоўшы і ўбачыўшы, прамінуў яго.
33 А Самаранін нейкі, ідучы, падыйшоў да яго і, убачыўшы яго, зьлітаваўся.
34 І, падыйшоўшы, перавязаў яму раны, паліўшы алеем і віном; і, пасадзіўшы яго на свайго
асла, прывёз яго ў карчму, і паклапаціўся пра яго.
35 А на другі дзень, адыходзячы, дастаў два дынары, даў карчмару і сказаў яму: “Паклапаціся
пра яго і, калі выдасі што болей, я, вярнуўшыся, аддам табе”.
36 Хто з гэтых трох, ты думаеш, стаўся бліжнім таму, які натрапіў на разбойнікаў?»
37 Ён сказаў: «Той, які зьлітаваўся над ім». Тады Ісус сказаў яму: «Ідзі і ты рабі гэтак».
38 І сталася, як яны ішлі, прыйшоў Ён у нейкае мястэчка; а адна жанчына, на імя Марта,
прыняла Яго ў дом свой.
39 І ў яе была сястра, якую звалі Марыя, якая, сеўшы ля ног Ісуса, слухала слова Ягонае.
40 А Марта завіхалася ва ўсякай паслузе і, стаўшы, сказала: «Госпадзе! Ці ж Цябе не клапоціць,
што сястра мая пакінула мяне адну паслугаваць? Скажы ёй, каб дапамагла мне».
41 Адказваючы, Ісус сказаў ёй: «Марта, Марта! Ты клапоцішся і турбуешся пра многае,
42 а адно толькі патрэбна. Марыя ж выбрала добрую частку, якая ня будзе забраная ў яе».

Лк 11

1 І сталася, як Ён у адным месцы маліўся, калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму:
«Госпадзе! Навучы нас маліцца, як і Ян навучыў вучняў сваіх».
2 Ён жа сказаў ім: «Калі моліцеся, кажыце: “Ойча наш, Які ёсьць у небе! Сьвяціся імя Тваё,
прыйдзі Валадарства Тваё; будзь воля Твая, як у небе, так і на зямлі.
3 Хлеба нашага штодзённага давай нам кожны дзень.
4 І адпусьці нам грахі нашыя, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу,
але збаў нас ад злога”».
5 І сказаў ім: «Нехта з вас, маючы сябра, прыйдзе да яго апоўначы і скажа яму: “Сябра! пазыч
мне тры хлябы,
6 бо сябра мой з дарогі зайшоў да мяне, і мне няма чаго даць яму”.
7 А той, адказваючы з хаты, скажа: “Не дакучай мне; дзьверы ўжо замкнёныя, і дзеці мае са
мною ў ложку; не магу ўстаць і даць табе”.
8 Кажу вам, калі ён, устаўшы, ня дасьць яму дзеля сяброўства з ім, дык дзеля дакучлівасьці
яго, устаўшы, дасьць яму, колькі просіць.
9 І Я кажу вам: “Прасіце, і дадзена вам будзе; шукайце, і знойдзеце; стукайце, і адчыняць вам.
10 Бо ўсякі, хто просіць, атрымлівае; і хто шукае, знаходзіць; і хто стукае, адчыняць таму”.
11 Хто з вас бацька, калі сын папросіць хлеба, дасьць яму камень? Ці [калі папросіць] рыбы,
дасьць яму зьмяю замест рыбы?
12 Ці калі папросіць яйка, дасьць яму скарпіёна?
13 Дык вось, калі вы, будучы злымі, умееце добрыя дары даваць дзецям вашым, тым больш
Айцец Нябесны дасьць Духа Сьвятога тым, што просяць у Яго».
14 І было, выгнаў Ён дэмана, які быў нямы; і, калі дэман выйшаў, нямы стаў гаварыць; і натоўп
зьдзівіўся.
15 Некаторыя з іх казалі: «Праз Бэльзэбула, князя дэманаў, Ён выганяе дэманаў».
16 А іншыя, спакушаючы, патрабавалі ў Яго знаку з неба.
17 Але Ён, ведаючы разважаньні іхнія, сказаў ім: «Усякае валадарства, якое разьдзялілася само
ў сабе, апусьцее, і дом на дом упадзе.
18 Калі ж і шатан разьдзяліўся сам у сабе, дык як устаіць валадарства ягонае? Бо вы кажаце,
што Я праз Бэльзэбула выганяю дэманаў.
19 Калі ж Я праз Бэльзэбула выганяю дэманаў, сыны вашыя праз каго выганяюць іх? Дзеля
гэтага яны будуць судзьдзямі вашымі.
20 Калі ж Я пальцам Божым выганяю дэманаў, значыць дасягнула да вас Валадарства Божае.
21 Калі ўзброены асілак ахоўвае панадворак свой, тады ў бясьпецы маёмасьць ягоная.
22 Калі ж дужэйшы за яго, напаўшы, пераможа яго, бярэ ўсю зброю ягоную, на якую той
спадзяваўся, і раздае дабро ягонае.
23 Хто не са Мною, той супраць Мяне; і хто не зьбірае са Мною, той раскідае.
24 Калі нячысты дух выйдзе з чалавека, праходзіць праз бязводныя месцы, шукаючы
супачынку, і, не знаходзячы, кажа: “Вярнуся ў дом мой, адкуль я выйшаў”.
25 І, прыйшоўшы, знаходзіць яго вымеценым і прыбраным.
26 Тады ідзе і бярэ з сабою сем іншых духаў, зьлейшых за сябе, і, увайшоўшы, жывуць там; і
бывае для чалавека таго апошняе горш за першае».
27 І сталася, калі Ён гаварыў гэтае, адна жанчына, азваўшыся з натоўпу, сказала Яму:
«Шчасьлівае ўлоньне, якое насіла Цябе, і грудзі, якія кармілі Цябе!»
28 А Ён сказаў: «Наадварот, шчасьлівыя тыя, якія чуюць слова Божае і захоўваюць яго».
29 Калі ж натоўп пачаў зьбірацца, Ён пачаў гаварыць: «Пакаленьне гэтае злое; яно шукае знаку,
і знак ня будзе дадзены яму, апрача знаку Ёны прарока.
30 Бо, як Ёна стаўся знакам для Ніневіцаў, так будзе і Сын Чалавечы для пакаленьня гэтага.
31 Валадарка з Поўдня ўстане на суд з людзьмі пакаленьня гэтага і асудзіць іх, бо яна прыйшла
з краю зямлі паслухаць мудрасьць Салямона, і вось, тут большы за Салямона.

32 Ніні́ўцы ўстануць на суд з пакаленьнем гэтым і асудзяць яго, бо яны навярнуліся праз
пропаведзь Ёны, і вось, тут большы за Ёну.
33 Бо ніхто, запаліўшы сьвечку, не стаўляе яе ў тайным месцы, ці пад пасудзіну, але на
сьвечніку, каб тыя, што ўваходзяць, бачылі сьвятло.
34 Сьветач цела ёсьць вока; дык вось, калі вока тваё будзе чыстае, тады і ўсё цела тваё сьветлае,
а калі яно будзе злое, тады і цела тваё цёмнае.
35 Дык зважай, каб сьвятло, што ў табе, не было цемрай.
36 Калі ж цела тваё ўсё сьветлае і ня мае ніводнае цёмнае часткі, дык будзе сьветлае ўсё, нібы
бліскавіца асьвятліла цябе».
37 Калі Ён сказаў гэтае, адзін фарысэй прасіў Яго, каб Ён абедаў у яго, і Ён, прыйшоўшы, узьлёг.
38 Фарысэй жа зьдзівіўся, што Ён не абмыўся перад бяседай.
39 Але Госпад сказаў яму: «Цяпер вы, фарысэі, келіх і місу звонку ачышчаеце, а нутро вашае
напоўненае рабункам і зласьлівасьцю.
40 Неразумныя! Ці ня Той, Хто зрабіў тое, што звонку, зрабіў і нутро?
41 Давайце лепш міласьціну з таго, што ў вас унутры ёсьць, і тады ўсё будзе ў вас чыстае.
42 Але гора вам, фарысэі, што вы даяцё дзесяціну з мяты, руты і ўсякай гародніны, і абмінаеце
суд і любоў Божую; і гэтае мусіце рабіць, і таго не пакідаць.
43 Гора вам, фарысэі, што любіце першыя месцы ў сынагогах і вітаньні на рынках.
44 Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што вы быццам магілы схаваныя, і людзі,
ходзячы над імі, ня ведаюць гэтага».
45 Адказваючы, нейкі законьнік кажа Яму: «Настаўнік, кажучы гэта, Ты і нас зьневажаеш».
46 Ён жа сказаў: «І вам, законьнікі, гора, што вы абцяжарваеце людзей цяжарамі невыноснымі,
а самі адным пальцам сваім не кранаеце цяжараў.
47 Гора вам, што будуеце магілы прарокам, а бацькі вашыя забівалі іх.
48 Гэтым вы сьведчыце і згаджаецеся са справамі бацькоў вашых, што яны сапраўды забілі іх;
а вы будуеце ім магілы.
49 Дзеля гэтага і мудрасьць Божая сказала: “Пашлю да іх прарокаў і апосталаў, і з іх адных
будуць забіваць, а другіх будуць перасьледаваць”,
50 каб была спагнаная з пакаленьня гэтага кроў усіх прарокаў, пралітая ад заснаваньня сьвету,
51 ад крыві Абэля да крыві Захарыі, забітага паміж ахвярнікам і Домам [Божым]. Так, кажу
вам: будзе спагнана з пакаленьня гэтага.
52 Гора вам, законьнікі, што вы ўзялі ключ разуменьня: самі не ўвайшлі і тым, што ўваходзілі,
забаранілі».
53 Калі ж Ён гаварыў ім гэтае, кніжнікі і фарысэі пачалі дужа злавацца і дапытвацца ў Яго пра
многае,
54 цікуючы на Яго і шукаючы злавіць [слова] з вуснаў Ягоных, каб абвінаваціць Яго.

Лк 12

1 Тым часам сабраўся шматтысячны натоўп, ажно ціснулі адзін аднаго, і Ён пачаў гаварыць
спачатку да вучняў Сваіх: «Сьцеражыцеся кісьлі фарысэйскай, якая ёсьць крывадушнасьць.
2 Бо няма нічога прыхаванага, што б не адкрылася, і тайнага, пра што б не даведаліся.
3 Дык што вы кажаце ў цемры, будзе пачута ў сьвятле; і што скажаце на вуха ў пакоях, будзе
абвешчана з даха ў.
4 Кажу ж вам, сябры Мае: ня бойцеся тых, якія забіваюць цела і пасьля гэтага ня могуць больш
нічога зрабіць.
5 Перасьцерагаю ж вас, каго баяцца: бойцеся Таго, Які мае ўладу, забіўшы, укінуць у геенну.
Так, кажу вам, Яго бойцеся.
6 Ці ня пяць вераб’ёў прадаюцца за два асары? І аніводзін з іх не забыты перад Богам.
7 Але ў вас і валасы на галаве ўсе палічаны. Дык ня бойцеся; вы даражэй за многіх вераб’ёў.
8 Кажу ж вам: усякага, хто прызнае Мяне перад людзьмі, і Сын Чалавечы прызнае перад
анёламі Божымі,

9 а хто адрачэцца Мяне перад людзьмі, ад таго адракуцца перад анёламі Божымі.
10 І ўсякаму, хто скажа слова на Сына Чалавечага, будзе адпушчана, а хто будзе блюзьніць на
Духа Сьвятога, таму ня будзе адпушчана.
11 А калі прывядуць вас у сынагогі, і да начальнікаў, і да ўладаў, не клапаціцеся, як ці што
будзеце адказваць, ці што будзеце гаварыць,
12 бо Дух Сьвяты навучыць вас у тую гадзіну, што мусіце гаварыць».
13 Нехта з натоўпу сказаў Яму: «Настаўнік! Скажы брату майму, каб ён падзяліўся са мною
спадчынай».
14 Ён жа сказаў яму: «Чалавеча, хто паставіў Мяне судзьдзём ці разьмеркавальнікам між
вамі?»
15 Пры гэтым сказаў ім: «Глядзіце і захоўвайце сябе ад хцівасьці, бо жыцьцё чалавека ня ў
мностве маёмасьці яго»
16 І сказаў ім прыповесьць, кажучы: «У аднаго багатага чалавека быў добры ўраджай у полі,
17 і ён разважаў у сабе, кажучы: “Што мне зрабіць, бо ня маю, куды злажыць плады мае?”
18 І сказаў: “Вось што зраблю: раскідаю сьвірны мае, і пабудую большыя, і зьбяру туды ўсю
пшаніцу маю і ўсё дабро маё,
19 і скажу душы маёй: ‘Душа! Шмат дабра ляжыць у цябе на шмат год; супакойся, еш, пі,
весяліся’.”
20 А Бог сказаў яму: “Неразумны! У гэту ноч душу тваю возьмуць у цябе; каму ж дастанецца
тое, што ты прыдбаў?”
21 Так бывае з тым, хто зьбірае скарбы для сябе, а ня ў Бога багацее».
22 Пры гэтым сказаў вучням Сваім: «Дзеля таго кажу вам: Не клапаціцеся дзеля душы вашай,
што вам есьці, ані дзеля цела, у што адзецца.
23 Душа большая за ежу, і цела — за адзеньне.
24 Паглядзіце на груганоў, якія ані сеюць, ані жнуць, няма ў іх камораў, ані сьвірнаў, і Бог
жывіць іх. Наколькі ж вы лепшыя за птушак?
25 І хто з вас сваім клопатам можа дадаць сабе росту хоць на адзін локаць?
26 Дык вось, калі і найменшага ня можаце, навошта клапоціцеся пра іншае?
27 Паглядзіце на лілеі, як яны растуць, не працуюць, не прадуць; але кажу вам, што і Салямон
ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як кожная з іх.
28 Калі ж траву на полі, якая сёньня ёсьць, а заўтра будзе кінута ў печ, Бог так апранае, дык
тым больш вас, малаверы.
29 І вы не шукайце, што вам есьці, ці што піць, і не турбуйцеся.
30 Бо ўсё гэта шукаюць народы гэтага сьвету; а ваш Айцец ведае, што вам гэта патрэбна.
31 Найбольш шукайце Валадарства Божага, і тое ўсё дададуць вам.
32 Ня бойся, малы статак, бо Айцец ваш упадабаў даць вам Валадарства.
33 Прадавайце маёмасьць вашую і давайце міласьціну; учыніце сабе кайстры, якія не старэюць,
скарб у небе, які не зьнікае, куды злодзей не набліжаецца, і дзе моль ня нішчыць.
34 Бо дзе ёсьць скарб ваш, там будзе і сэрца вашае.
35 Няхай будуць паясьніцы вашыя падперазаныя, і сьвечкі запаленыя,
36 і вы — падобныя да людзей, якія чакаюць вяртаньня гаспадара свайго з вясельля, каб, як
прыйдзе і пастукаецца, адразу адчыніць яму.
37 Шчасьлівыя тыя слугі, якіх гаспадар, прыйшоўшы, знойдзе, што яны чуваюць. Сапраўды
кажу вам: ён падпярэжацца, і пасадзіць іх, і, падыйшоўшы, будзе паслугаваць ім.
38 І калі прыйдзе ў другую варту, і ў трэцюю варту прыйдзе, і знойдзе іх так, то шчасьлівыя
слугі тыя.
39 Бо вы ведаеце, што, калі б ведаў гаспадар дому, а якой гадзіне прыйдзе злодзей, ён чуваў бы
і не дапусьціў падкапаць дом свой.
40 І вы таму будзьце гатовыя, бо Сын Чалавечы прыйдзе ў гадзіне, пра якую ня думаеце».
41 Сказаў жа Яму Пётар: «Госпадзе! Ці да нас гаворыш гэтую прыповесьць, ці да ўсіх?»

42 А Госпад сказаў: «Хто ёсьць верны і мудры аканом, якога пан паставіць над слугамі сваімі
раздаваць ім у свой час меру хлеба?
43 Шчасьлівы той слуга, якога пан ягоны, прыйшоўшы, знойдзе, што робіць гэта.
44 Сапраўды кажу вам, што над усёй маёмасьцю сваёй паставіць яго.
45 Калі ж слуга той скажа ў сэрцы сваім: “Марудзіць прыйсьці пан мой”, — і пачне біць слугаў
і служак, і есьці, і піць, і напівацца,
46 прыйдзе пан слугі таго ў дзень, які ён не чакае, і ў гадзіну, пра якую ня ведае, і адлучыць
яго, і ўчыніць яму адзін лёс з бязьвернымі.
47 Слуга ж той, які ведаў волю пана свайго, і ня быў гатовы, і не рабіў паводле волі ягонай,
будзе моцна біты,
48 а які ня ведаў і зрабіў вартае кары, біты будзе меней. Бо ад кожнага, каму дадзена шмат,
шмат і вымагацца будзе, і каму шмат даручана, з таго больш запатрабуюць.
49 Агонь прыйшоў Я кінуць на зямлю, і як хачу, каб ён ужо загарэўся!
50 Бо хрышчэньнем павінен Я хрысьціцца, і як Я ня маю спакою, пакуль гэта ня зьдзейсьніцца!
51 Ці думаеце вы, што Я прыйшоў даць супакой зямлі? Не, кажу вам, але разьдзяленьне.
52 Бо адгэтуль пяцёра ў адным доме падзеляцца, трое супраць двух і двое супраць трох.
53 Падзеляцца бацька супраць сына, і сын супраць бацькі; маці супраць дачкі, і дачка супраць
маці; сьвякруха супраць нявесткі сваёй, і нявестка супраць сьвякрухі сваёй».
54 Сказаў таксама і натоўпам: «Калі вы бачыце воблака, якое падымаецца з захаду, адразу
кажаце: “Дождж набліжаецца”, — і стаецца гэтак.
55 І калі дзьме паўднёвы вецер, кажаце: “Сьпёка будзе”, — і стаецца.
56 Крывадушнікі! Аблічча зямлі і неба распазнаваць умееце, як жа часу гэтага не пазнаяцё?
57 Чаму ж вы сябе саміх ня судзіце праведна?
58 Бо калі ты ідзеш з супраціўнікам сваім да начальніка, па дарозе аддай заробленае, каб
пазбыцца яго, каб ён не прывёў цябе да судзьдзі, і судзьдзя не аддаў бы цябе кату, і кат ня
кінуў бы цябе ў вязьніцу.
59 Кажу табе: Ня выйдзеш адтуль, пакуль не аддасі яму і апошняй лепты».

Лк 13

1 У той час прыйшлі некаторыя, расказваючы Яму пра Галілейцаў, кроў якіх Пілат зьмяшаў з
ахвярамі іхнімі.
2 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Ці вы думаеце, што гэтыя Галілейцы былі больш грэшныя за
ўсіх Галілейцаў, што яны перацярпелі гэтак?
3 Не, кажу вам; але, калі не навернецеся, усе гэтаксама загінеце.
4 Або ці думаеце, што тыя васямнаццаць, на якіх упала вежа ў Сілааме і пабіла іх, больш
вінаватыя былі за ўсіх, хто жыў у Ерусаліме?
5 Не, кажу вам; але, калі не навернецеся, усе гэтаксама загінеце».
6 І сказаў такую прыповесьць: «Нехта меў у вінаградніку сваім пасаджанае фігавае дрэва, і
прыйшоў шукаць плоду на ім, і не знайшоў.
7 І сказаў вінаградару: “Вось, я тры гады прыходжу шукаць плоду на гэтым фігавым дрэве і не
знаходжу; сьсячы яго, навошта яно і зямлю займае?”
8 Той жа, адказваючы, кажа яму: “Пане, пакінь яго і на гэты год, пакуль я абкапаю яго і абкладу
гноем,
9 ці ня дасьць плоду; а калі не, дык на той год сьсячэш яго”».
10 У адной сынагозе Ён навучаў у суботу.
11 І вось, была жанчына, якая васямнаццаць гадоў мела духа нядужасьці, і яна была
скорчыўшыся, і не магла выпрастацца.
12 Угледзеўшы яе, Ісус паклікаў яе і сказаў ёй: «Жанчына! Ты вызвалена ад нядужасьці тваёй».
13 І ўсклаў на яе рукі, і яна адразу выпрасталася і пачала славіць Бога.

14 На гэта начальнік сынагогі, абураючыся, што Ісус аздаравіў у суботу, сказаў натоўпу: «Ёсьць шэсьць дзён, калі мусіце працаваць, тады і прыходзьце, каб быць аздароўленымі, а ня ў дзень
суботы».
15 Тады Госпад адказаў яму і сказаў: «Крывадушнік! Ці не адвязвае кожны з вас вала свайго ці
асла ад ясьляў у суботу і не вядзе паіць?
16 А гэтую дачку Абрагама, якую зьвязаў шатан вось ужо васямнаццаць гадоў, ці ж не належала
звольніць ад путаў гэтых у дзень суботы?»
17 І калі гаварыў Ён гэтае, усе супраціўнікі Ягоныя засаромеліся; і ўвесь народ радаваўся з усіх
слаўных дзеяньняў Ягоных.
18 Ён жа сказаў: «Да чаго падобнае Валадарства Божае, і з чым параўнаю яго?
19 Яно падобнае да зярняці гарчычнага, якое, узяўшы, пасадзіў чалавек у садзе сваім, і яно
вырасла, і сталася вялікім дрэвам, і птушкі нябесныя хаваліся ў галінах ягоных».
20 І зноў сказаў: «З чым параўнаю Валадарства Божае?
21 Яно падобнае да кіслі, якую жанчына ўзяла і ўмяшала ў тры меры мукі, пакуль ня ўкісла
ўсё».
22 І праходзіў па гарадах і мястэчках, навучаючы і кіруючы шлях свой да Ерусаліму.
23 Нехта сказаў яму: «Госпадзе! Няўжо мала тых, якія будуць збаўленыя?» Ён жа сказаў ім:
24 «Намагайцеся ўвайсьці праз цесную браму, бо, кажу вам, многія будуць шукаць увайсьці і
ня здолеюць.
25 Калі гаспадар дому ўстане і зачыніць дзьверы, тады вы станеце звонку і пачняцё стукаццца ў
дзьверы, кажучы: “Госпадзе! Госпадзе! Адчыні нам!” І Ён, адказваючы, скажа вам: “Ня ведаю
вас, адкуль вы”.
26 Тады пачняцё гаварыць: “Мы елі і пілі перад Табою, і на вуліцах нашых навучаў Ты”.
27 І Ён скажа: “Кажу вам, Я ня ведаю вас, адкуль вы; адыйдзіце ад Мяне ўсе, якія робяць
няправеднасьць”.
28 Там будзе плач і скрыгат зубоў, калі ўгледзіце Абрагама, Ісаака, і Якуба, і ўсіх прарокаў у
Валадарстве Божым, а вас выганяць прэч.
29 І прыйдуць з усходу, і з захаду, і з поўначы, і з поўдня, і ўзьлягуць у Валадарстве Божым.
30 І вось ёсьць апошнія, якія будуць першымі, і ёсьць першыя, якія будуць апошнімі».
31 У той дзень падыйшлі некаторыя фарысэі, кажучы Яму: «Выходзь і ідзі адсюль, бо Ірад хоча
Цябе забіць».
32 І сказаў ім: «Ідзіце, скажыце гэтаму лісу: “Вось, Я выганяю дэманаў і аздараўляю сёньня і
заўтра, і ў трэці дзень скончу”.
33 Аднак мушу ісьці сёньня, і заўтра, і пазаўтра, бо ня можа стацца, каб прарок загінуў па-за
Ерусалімам.
34 Ерусалім, Ерусалім, які забіваеш прарокаў і камянуеш тых, што да цябе пасланыя! Колькі
разоў хацеў Я сабраць дзяцей тваіх, як птушка птушанят сваіх пад крыламі, і вы не захацелі.
35 Вось, пакідаецца вам дом ваш пусты. Бо сапраўды кажу вам, што вы ня ўбачыце Мяне,
пакуль ня прыйдзе час, калі скажаце: “Дабраслаўлёны Той, Які ідзе ў імя Госпада”».

Лк 14

1 І сталася прыйсьці Яму ў суботу ў дом аднаго з начальнікаў фарысэйскіх зьесьці хлеба, і яны
сачылі за Ім.
2 І вось, быў перад Ім нейкі апухлы чалавек.
3 І, адказваючы, сказаў Ісус законьнікам і фарысэям, кажучы: «Ці належыцца аздараўляць у
суботу?»
4 Яны ж маўчалі. І, дакрануўшыся, Ён аздаравіў яго і адпусьціў.
5 І, адказваючы ім, сказаў: «Калі ў каго з вас асёл ці вол упадзе ў калодзеж, ці не адразу выцягне
яго ў дзень суботні?»
6 І не маглі яны з Ім пра гэта спрачацца.

7 І ўгледзеўшы, як тыя, што былі запрошаныя, выбіралі першыя месцы, сказаў ім прыповесьць,
кажучы ім:
8 «Калі запросіць цябе нехта на вясельле, не ўзьлягай на першае месца, каб не было каго
паважнейшага за цябе паміж запрошаных ім.
9 І той, які запрасіў цябе і яго, падыйшоўшы, скажа табе: “Дай яму месца”, і тады ты з сорамам
павінен будзеш сесьці на апошняе месца.
10 Але, калі будзеш запрошаны, прыйшоўшы, узьлягай на апошняе месца, каб той, які запрасіў
цябе, калі падыйдзе, сказаў табе: “Сябра, перасядзь вышэй”. Тады будзе табе слава перад тымі,
што ўзьлягаюць разам з табою.
11 Бо ўсякі, хто сябе ўзвышае, будзе паніжаны, а хто сябе паніжае, будзе ўзвышаны».
12 Сказаў жа і таму, які запрасіў Яго: «Калі ладзіш бяседу ці вячэру, ня кліч сяброў тваіх, ані
братоў тваіх, ані сваякоў тваіх, ані суседзяў багатых, каб і яны цябе не запрасілі, і ты атрымаў
бы нагароду.
13 Але калі ты ладзіш пачастунак, запрашай убогіх, калекаў, кульгавых, сьляпых.
14 І шчасьлівы ты будзеш, што яны ня змогуць аднагародзіць табе, бо будзе аднагароджана
табе ва ўваскрасеньне праведных».
15 Пачуўшы гэта, нехта з тых, якія ўзьлягалі, сказаў Яму: «Шчасьлівы, хто будзе есьці хлеб у
Валадарстве Божым».
16 Ён жа сказаў яму: «Нейкі чалавек справіў вялікую вячэру, і паклікаў многіх,
17 і ў гадзіну вячэры паслаў слугу свайго сказаць запрошаным: “Прыходзьце, бо ўжо ўсё
падрыхтавана”.
18 І пачалі ўсе па чарзе выбачацца. Першы сказаў яму: “Я купіў зямлю, і мне трэба пайсьці і
паглядзець яе; прашу цябе, выбач мне”.
19 І другі сказаў: “Я купіў пяць параў валоў і іду выспрабаваць іх; прашу цябе, выбач мне”.
20 І другі сказаў: “Я ажаніўся і дзеля гэтага не магу прыйсьці”.
21 І, вярнуўшыся, слуга той паведаміў гэтае пану свайму. Тады, загневаўшыся, гаспадар дому
сказаў слузе свайму: “Ідзі хутчэй па вуліцах і завулках гораду і прывядзі сюды і ўбогіх, і
калекаў, і кульгавых, і сьляпых”.
22 І сказаў слуга: “Пане! Сталася, як ты сказаў, і яшчэ ёсьць месцы”.
23 І сказаў пан слузе: “Ідзі на дарогі і да платоў і змушай прыйсьці, каб напоўніўся дом мой,
24 бо кажу вам, што ніхто з тых мужоў, што былі запрошаныя, не пакаштуе маёй вячэры”».
25 І сабраліся шматлікія натоўпы да Яго, і, павярнуўшыся, Ён сказаў ім:
26 «Калі хто прыходзіць да Мяне і не зьненавідзіць бацьку свайго і маці, і жонку, і дзяцей, і
братоў, і сёстраў, а пры тым і саму душу сваю, той ня можа быць вучнем Маім.
27 І хто не нясе крыжа свайго і ідзе за Мною, ня можа быць вучнем Маім.
28 Бо хто з вас, хочучы пабудаваць вежу, сеўшы спачатку, не аблічыць выдаткаў, ці мае, каб
дакончыць яе,
29 каб, калі закладзе падмурак і ня здолее дакончыць, усе, якія гэта бачылі, ня сталі сьмяяцца
з яго,
30 кажучы: “Гэты чалавек пачаў будаваць і ня здолеў дакончыць!”
31 Або які валадар, ідучы на вайну супраць другога валадара, сеўшы спачатку, не парадзіцца,
ці магчыма з дзесяцьцю тысячамі супрацьстаць таму, хто ідзе на яго з дваццацьцю тысячамі.
32 Калі ж не, дык пакуль той яшчэ далёка, ён пашле да яго пасольства прасіць міру.
33 Гэтак усякі з вас, хто не адрачэцца ад усяго, што мае, ня можа быць вучнем Маім.
34 Соль добрая; калі ж соль згубіць сілу, чым прыправіць яе?
35 Ані ў зямлю, ані ў гной яна не надаецца, вон выкідаюць яе. Хто мае вушы каб слухаць, няхай
слухае».

Лк 15

1 Падыходзілі ж да Яго ўсе мытнікі і грэшнікі слухаць Яго.
2 І наракалі фарысэі і кніжнікі, кажучы: «Ён прыймае грэшнікаў і есьць разам з імі».

3 Ён жа сказаў ім гэткую прыповесьць, кажучы:
4 «Які чалавек з вас, маючы сто авечак і згубіўшы адну з іх, не пакідае дзевяноста дзевяць у
пустыні і не ідзе па згубленую, пакуль ня знойдзе яе?
5 І, знайшоўшы, бярэ яе на плечы свае з радасьцю.
6 І, прыйшоўшы дадому, склікае сяброў і суседзяў, кажучы ім: “Цешцеся са мною, бо я знайшоў
маю згубленую авечку”.
7 Кажу вам, што большая радасьць будзе ў небе з аднаго грэшніка, які навяртаецца, чым з
дзевяноста дзевяці праведнікаў, якія ня маюць патрэбы ў навяртаньні.
8 Або якая жанчына, што мае дзесяць драхмаў, калі згубіць адну драхму, не запальвае сьвечкі
і не пачынае месьці дом, і не шукае пільна, пакуль ня знойдзе?
9 А, знайшоўшы, склікае сяброўак і суседак, кажучы: “Цешцеся са мною, бо я знайшла драхму,
якую была згубіла”.
10 Такая, кажу вам, стаецца радасьць у анёлаў Божых з аднаго грэшніка, які навяртаецца».
11 Яшчэ сказаў: «У аднаго чалавека былі два сыны.
12 І сказаў малодшы з іх бацьку: “Бацька, дай мне належную частку маёмасьці”. І падзяліў ім
маёмасьць.
13 І праз некалькі дзён малодшы сын, сабраўшы ўсё, выправіўся ў далёкі край, і там змарнаваў
маёмасьць сваю, жывучы распусна.
14 Калі ж выдаткаваў усё, стаўся вялікі голад у тым краі, і ён пачаў мець нястачу.
15 І, пайшоўшы, прыстаў да аднаго з грамадзянаў таго краю, і той паслаў яго на поле сваё
даглядаць сьвіньняў.
16 І ён жадаў напоўніць жывот свой шалупіньнем, якое елі сьвіньні, і ніхто не даваў яму.
17 Апамятаўшыся, ён сказаў: “Колькі парабкаў у бацькі майго маюць лішак хлеба, а я паміраю
з голаду!
18 Устаўшы, пайду да бацькі майго і скажу яму: ‘Ойча! Я саграшыў супраць неба і перад табою,
19 і ўжо ня варты называцца сынам тваім; зрабі мяне адным з парабкаў тваіх’.”
20 І, устаўшы, прыйшоў да бацькі свайго. Калі ён быў яшчэ далёка, убачыў яго бацька ягоны і
зьлітаваўся, і, пабегшы, кінуўся яму на шыю, і цалаваў яго.
21 Сын жа сказаў яму: “Ойча! Я саграшыў супраць неба і перад табою, і ўжо ня варты называцца
сынам тваім”.
22 А бацька сказаў слугам сваім: “Прынясіце найлепшыя шаты, і апраніце яго, і дайце
пярсьцёнак на руку ягоную і сандалы на ногі.
23 І прывядзіце кормнае цяля, і закалеце, і, паеўшы, будзем весяліцца.
24 Бо гэты сын мой быў мёртвы і ажыў, прападаў і знайшоўся”. І пачалі весяліцца
25 А старэйшы сын ягоны быў у полі. І калі, варочаючыся, падыйшоў да дому, пачуў сьпевы і
скокі.
26 І, паклікаўшы аднаго са слугаў сваіх, спытаўся: “Што гэта адбываецца?”
27 Той жа сказаў яму: “Брат твой прыйшоў, і бацька твой закалоў кормнае цяля, бо атрымаў
яго здаровым”.
28 Загневаўся ён і не хацеў увайсьці. Тады бацька ягоны, выйшаўшы, клікаў яго.
29 А ён, адказваючы, сказаў бацьку: “Вось, я столькі гадоў служу табе і ніколі не адступіў ад
прыказаньня твайго, і ты ніколі ня даў мне і казьляняці, каб мне павесяліцца з сябрамі маімі.
30 А калі гэты сын твой, пажоршы маёмасьць тваю з распусьніцамі, прыйшоў, ты закалоў для
яго кормнае цяля”.
31 Ён жа сказаў яму: “Дзіця! Ты заўсёды са мною, і ўсё маё — тваё.
32 А з таго трэба цешыцца і радавацца, што брат твой гэты быў мёртвы і ажыў, прападаў і
знайшоўся”».

Лк 16

1 Сказаў жа і да вучняў Сваіх: «Адзін чалавек быў багаты і меў аканома, і данясьлі яму на яго,
што ён марнуе маёмасьць ягоную.

2 І, паклікаўшы яго, сказаў яму: “Што гэта я чую пра цябе? Дай справаздачу з гаспадараваньня
твайго, бо ты ня можаш больш гаспадараваць”.
3 Сказаў сам у сабе аканом: “Што мне рабіць, бо пан мой забірае ад мяне гаспадараваньне?
Капаць ня здолею, жабраваць саромеюся.
4 Ведаю, што зраблю, каб прынялі мяне ў дамы свае, калі адстаўлены буду ад
гаспадараваньня”.
5 І, паклікаўшы даўжнікоў пана свайго кожнага паасобку, сказаў першаму: “Колькі ты вінен
пану майму?”
6 Той сказаў: “Сто мер алею”. І сказаў яму: “Вазьмі напісанае табою і, сеўшы, хутчэй напішы
пяцьдзясят”.
7 Пасьля другому сказаў: “А ты колькі вінен?” Той сказаў: “Сто мер пшаніцы”. І гаворыць яму:
“Вазьмі напісанае табою і напішы: восемдзясят”.
8 І пахваліў пан аканома няправеднага, што мудра ўчыніў; бо сыны веку гэтага мудрэйшыя за
сыноў сьвятла ў пакаленьні сваім.
9 І Я кажу вам: здабывайце сабе сяброў мамонай няправеднай, каб яны, як зьбяднееце,
прынялі вас у вечныя намёты.
10 Верны ў малым, і ў многім верны, і няправедны ў малым, і ў многім няправедны.
11 Дык вось, калі вы ў няправеднай мамоне не былі верныя, хто даверыць вам сапраўднае?
12 І калі вы ў чужым не былі верныя, хто дасьць вам вашае?
13 Ніякі слуга ня можа служыць двум панам, бо ці аднаго будзе ненавідзець, а другога любіць,
ці аднаго будзе трымацца, а другім пагарджаць. Ня можаце Богу служыць і мамоне».
14 Чулі ўсё гэтае і фарысэі, якія былі срэбралюбцамі, і насьміхаліся з Яго.
15 І Ён сказаў ім: «Вы апраўдваеце сябе перад людзьмі, але Бог ведае сэрцы вашыя, бо што
вельмі высока ў людзей, тое агіда перад Богам.
16 Закон і Прарокі да Яна; адгэтуль жа Валадарства Божае дабравесьціцца, і кожны сілаю
здабывае яго.
17 Але хутчэй неба і зямля прамінуць, чым адна рыска з Закону загіне.
18 Кожны, хто разводзіцца з жонкаю сваёю і жэніцца з другой, чужаложыць, і кожны, хто
жэніцца з разьведзенай з мужам, чужаложыць.
19 Адзін чалавек быў багаты, і апранаўся ў пурпур і вісон, і кожны дзень гучна весяліўся.
20 А нейкі ўбогі, на імя Лазар, ляжаў ля брамы ягонай увесь у скулах,
21 і жадаў насыціцца крошкамі, што падалі са стала багацея, і сабакі, прыходзячы, лізалі скулы
ягоныя.
22 І сталася, убогі памёр і аднесены быў анёламі на ўлоньне Абрагама; памёр і багацей, і быў
пахаваны.
23 І ў пекле, пакутуючы, ён, падняўшы вочы свае, убачыў здалёк Абрагама і Лазара на ўлоньні
ягоным,
24 і, загаласіўшы, сказаў: “Ойча Абрагаме! Зьлітуйся нада мною і пашлі Лазара, каб абмачыў
канец пальца свайго ў вадзе і асьвяжыў язык мой, бо я мучуся ў полымі гэтым”.
25 Але Абрагам сказаў: “Сыне! Узгадай, што ў жыцьці тваім меў ты добрае, а Лазар — ліхоту;
цяпер жа ён тут суцяшаецца, а ты мучышся.
26 І да таго паміж намі і вамі вялікая прорва разьмешчана, так што тыя, хто хочуць перайсьці
адгэтуль да вас, ня могуць, і адтуль да нас не пераходзяць”.
27 Сказаў жа ён: “Тады прашу цябе, ойча, каб ты паслаў яго ў дом бацькі майго,
28 бо ў мяне пяць братоў; няхай ён засьведчыць ім, каб і яны не прыйшлі ў гэтае месца
пакутаў”.
29 Кажа яму Абрагам: “Маюць Майсея і прарокаў, няхай іх слухаюць”.
30 Ён жа сказаў: “Не, ойча Абрагаме! Але калі хто з памёршых прыйдзе да іх, навернуцца”.
31 Сказаў жа яму [Абрагам]: “Калі Майсея і прарокаў ня слухаюць, нават калі хто і з памёршых
уваскрэсьне, не паверацъ”».

Лк 17

1 І сказаў вучням Сваім: «Згаршэньні ня могуць не прыйсьці, але гора таму, праз каго яны
прыходзяць.
2 Лепей яму, калі камень ад жорнаў вісіць у яго на шыі і ён кінуты ў мора, чым каб ён згоршыў
аднаго з малых гэтых.
3 Сьцеражыцеся. Калі ж саграшыць супраць цябе брат твой, дакарай яго і, калі навернецца,
даруй яму.
4 І калі сем разоў у дзень саграшыць супраць цябе, і сем разоў у дзень зьвернецца да цябе,
кажучы: “Каюся”, даруй яму».
5 І сказалі апосталы Госпаду: «Дадай нам веры».
6 А Госпад сказаў: «Калі б вы мелі веру як зерне гарчычнае і сказалі гэтаму фігаваму дрэву:
“Будзь вырванае з коранем і перасаджанае ў мора”, яно паслухала б вас.
7 А хто з вас, маючы слугу, які арэ ці пасьвіць, калі ён прыйдзе з поля, скажа: “Ідзі хутчэй,
узьляж [за сталом]”?
8 Але ж ці ня скажа яму: “Падрыхтуй мне вячэру і, падперазаўшыся, паслугуй мне, пакуль
буду есьці ды піць, і пасьля гэтага еш і пі сам”?
9 Ці дзякуе ён слузе гэтаму за тое, што зрабіў загаданае яму? Ня думаю.
10 Так і вы, калі зробіце ўсё, што загадана вам, кажыце: “Мы — слугі нягодныя, бо зрабілі, што
павінны былі зрабіць”».
11 І сталася, як ішоў у Ерусалім, праходзіў між Самарыяй і Галілеяй.
12 І, калі ўваходзіў Ён у адно мястэчка, сустрэлі яго дзесяць пракажоных, якія сталі здалёк.
13 І ўзвысілі яны голас, кажучы: «Ісусе, Настаўнік! Зьлітуйся над намі».
14 І, убачыўшы, Ён сказаў ім: «Ідзіце, пакажыцеся сьвятарам». І сталася, калі яны ішлі, былі
ачышчаныя.
15 Адзін жа з іх, бачачы, што аздароўлены, вярнуўся, моцным голасам славячы Бога,
16 і ўпаў на твар ля ног Яго, дзякуючы Яму, і гэта быў Самаранін.
17 Адказваючы, Ісус сказаў: «Ці ня дзесяць былі ачышчаныя? Дзе ж дзевяць?
18 Яны не вярнуліся аддаць славу Богу, апрача гэтага чужынца».
19 І сказаў яму: «Устань, ідзі. Вера твая збавіла цябе».
20 Запытаны ж фарысэямі, калі прыйдзе Валадарства Божае, адказаў ім і сказаў: «Не
прыходзіць Валадарства Божае відавочна.
21 І ня скажуць: “Вось, яно тут”, ці: “Вось, там”. Бо вось, Валадарства Божае ўнутры вас ёсьць».
22 Вучням жа сказаў: «Прыйдуць дні, калі зажадаеце бачыць хоць адзін дзень Сына Чалавечага,
і ня ўбачыце.
23 І скажуць вам: “Вось, тут”, ці: “Вось, там”, — не хадзіце і не ганяйцеся,
24 бо як бліскавіца, мільгануўшы, з аднаго краю неба да другога краю неба сьвеціць, так будзе
і Сын Чалавечы ў дзень Свой.
25 Спачатку ж Ён мусіць шмат перацярпець і быць адкінутым пакаленьнем гэтым.
26 І як было ў дні Ноя, так будзе ў дні Сына Чалавечага:
27 елі, пілі, жаніліся, выходзілі замуж да таго дня, як Ной увайшоў у каўчэг, і прыйшоў патоп,
і загубіў усіх.
28 Падобна як было ў дні Лота: елі, пілі, куплялі, продалі, садзілі, будавалі,
29 а ў дзень, калі Лот выйшаў з Садому, лінуў з неба агонь з серкаю і загубіў усіх.
30 Такім будзе той дзень, калі зьявіцца Сын Чалавечы.
31 У той дзень, хто будзе на даху, а рэчы яго ў доме, няхай не зыходзіць узяць іх; і хто будзе ў
полі, няхай не варочаецца.
32 Памятайце жонку Лота.
33 Бо хто шукае, каб здабыць душу сваю, той загубіць яе; а хто загубіць яе, той ажывіць яе.
34 Кажу вам, у тую ноч будуць двое на адным ложку, адзін будзе ўзяты, а другі — пакінуты;
35 дзьве будуць малоць разам, адна будзе ўзятая, а другая — пакінутая;
36 двое будуць у полі, адзін будзе ўзяты, а другі — пакінуты».

37 І, адказваючы, кажуць Яму: «Дзе, Госпадзе?» Ён жа сказаў ім: «Дзе цела, там зьбяруцца і
арлы».

Лк 18

1 Сказаў таксама ім прыповесьць пра тое, што трэба заўсёды маліцца і не журыцца,
2 кажучы: «У адным горадзе быў судзьдзя, які Бога не баяўся і людзей не саромеўся.
3 У тым жа горадзе была ўдава, і яна прыходзіла да яго, кажучы: “Абарані мяне ад супраціўніка
майго”.
4 І ён доўгі час не хацеў. А пасьля сказаў сам сабе: “Хоць я і Бога не баюся, і людзей не
саромеюся,
5 але, як гэтая ўдава дакучае мне, абараню яе, каб яна, прыходзячы бясконца, ня вымучыла
мяне”».
6 І сказаў Госпад: «Чуеце, што кажа судзьдзя няправедны?
7 А Бог ці ж не абароніць выбраных Сваіх, якія клічуць да Яго дзень і ноч, і будзе
доўгацярплівым, [ня слухаючы] іх?
8 Кажу вам, што хутка абароніць іх. Але Сын Чалавечы, прыйшоўшы, ці знойдзе веру на
зямлі?»
9 Сказаў жа і да тых, якія былі пэўныя адносна сябе, што яны праведнікі, і пагарджалі іншымі,
гэткую прыповесьць:
10 «Два чалавекі ўвайшлі ў сьвятыню памаліцца: адзін — фарысэй, а другі — мытнік.
11 Фарысэй, стаўшы, гэтак маліўся за сябе: “Божа, дзякую Табе, што я не такі, як іншыя людзі:
рабаўнікі, няправеднікі, чужаложнікі, або як гэты мытнік.
12 Пошчу два разы на тыдзень, даю дзесяціну з усяго, што прыдбаю”.
13 А мытнік, стаўшы здалёк, не хацеў нават падняць вачэй у неба, але біў сябе ў грудзі, кажучы:
“Божа! Будзь міласьцівы да мяне, грэшніка”.
14 Кажу вам, што гэты пайшоў апраўданым у дом свой, а ня той: бо ўсякі, хто сябе ўзвышае,
будзе паніжаны, а хто сябе паніжае, будзе ўзвышаны».
15 Прыносілі да яго і немаўлят, каб Ён дакрануўся да іх. Убачыўшы гэтае, вучні сварыліся на
іх.
16 А Ісус, паклікаўшы іх, сказаў: «Дазвольце дзецям прыходзіць да Мяне і не забараняйце ім,
бо гэткіх ёсьць Валадарства Божае.
17 Сапраўды кажу вам: Хто ня прыйме Валадарства Божага, як дзіця, той ня ўвойдзе ў яго».
18 І спытаўся ў Яго нехта з начальнікаў, кажучы: «Настаўнік добры! Што мне рабіць, каб
успадкаеміць жыцьцё вечнае?»
19 А Ісус сказаў яму: «Чаму гаворыш Мне “добры”? Ніхто ня добры, акрамя аднаго Бога.
20 Ведаеш прыказаньні: “Не чужалож”, “не забівай”, “не крадзі”, “ня сьведчы фальшыва”,
“шануй бацьку твайго і маці тваю”».
21 Ён жа сказаў: «Усё гэта я захоўваў ад юнацтва майго».
22 Пачуўшы гэтае, Ісус сказаў яму: «Яшчэ аднаго не хапае табе: усё, што маеш, прадай, і раздай
убогім, і будзеш мець скарб у небе; і прыходзь, ідзі за Мною».
23 Ён жа, пачуўшы гэта, стаўся смутным, бо быў надта багаты.
24 Убачыўшы, што ён стаўся смутным, Ісус сказаў: «Як цяжка таму, хто мае багацьце, увайсьці
ў Валадарства Божае.
25 Бо лягчэй вярблюду прайсьці праз іголчына вушка, чым багатаму ўвайсьці ў Валадарства
Божае».
26 А тыя, што чулі, сказалі: «І хто ж можа быць збаўленым?»
27 Ён жа сказаў: «Немагчымае для людзей магчыма для Бога».
28 А Пётар сказаў: «Вось, мы пакінулі ўсё і пайшлі за Табою».
29 Ён жа сказаў ім: «Сапраўды кажу вам: няма нікога, хто, пакінуўшы дом, або бацькоў, або
братоў, або жонку, або дзяцей дзеля Валадарства Божага,
30 не атрымаў бы шмат больш у гэты час, а ў веку будучым — жыцьцё вечнае».

31 Узяўшы ж Дванаццаць, сказаў ім: «Вось, мы ўзыходзім у Ерусалім, і зьдзейсьніцца ўсё,
напісанае праз прарокаў пра Сына Чалавечага,
32 бо Ён будзе выдадзены паганам, і будуць зьдзеквацца, і зьневажаць, і пляваць [на Яго],
33 і, бічаваўшы, заб'юць Яго, і на трэці дзень Ён уваскрэсьне».
34 І яны нічога з гэтага не зразумелі; і словы гэтыя былі схаванымі для іх, і яны не разумелі
таго, што гаварылася.
35 І сталася, як набліжаўся Ён да Ерыхону, нейкі сьляпы сядзеў ля дарогі, жабруючы.
36 Пачуўшы, што праходзіць натоўп, ён спытаўся: «Што гэта такое?»
37 Яму паведамілі, што Ісус з Назарэту ідзе.
38 І закрычаў ён, кажучы: «Ісусе, Сыне Давідаў, зьлітуйся нада мною!»
39 І тыя, што ішлі наперадзе, сварыліся на яго, каб маўчаў, а ён яшчэ мацней закрычаў: «Сыне
Давідаў, зьлітуйся нада мною!»
40 Ісус, спыніўшыся, загадаў прывесьці яго да Сябе. І калі той падыйшоў, спытаўся ў яго,
41 кажучы: «Што ты хочаш, каб Я ўчыніў?» Той сказаў: «Госпадзе, каб мне глядзець».
42 І сказаў яму Ісус: «Глядзі! Вера твая збавіла цябе».
43 І ён адразу стаў бачыць, і пайшоў за Ім, славячы Бога. І ўвесь народ, бачачы гэтае, аддаў
хвалу Богу.

Лк 19

1 І, увайшоўшы, праходзіў Ён праз Ерыхон.
2 І вось, чалавек, якога звалі імем Закхей, і быў ён начальнік мытнікаў і чалавек багаты.
3 І ён шукаў убачыць Ісуса, які Ён, і ня мог з-за натоўпу, бо быў малы ростам.
4 І, забегшы наперад, узьлез на фігавае дрэва, каб убачыць Яго, бо ён меўся праходзіць каля
яго.
5 І калі прыйшоў на гэтае месца, Ісус, глянуўшы, убачыў яго і сказаў яму: «Закхей! Зыходзь
хутчэй, бо сёньня Я мушу спыніцца ў доме тваім».
6 І той пасьпешліва зыйшоў, і прыняў Яго з радасьцю.
7 І ўсе, якія бачылі ўсё гэта, наракалі, кажучы, што Ён увайшоў да грэшнага чалавека.
8 А Закхей, стаўшы, сказаў Госпаду: «Госпадзе! Вось, палову маёмасьці маёй я аддаю ўбогім,
і, калі каго абвінаваціў фальшыва, аддам учацьвёра».
9 Ісус жа сказаў яму: «Сёньня сталася збаўленьне дому гэтаму, таму што і ён — сын Абрагама.
10 Бо Сын Чалавечы прыйшоў знайсьці і збавіць тое, што было загінуўшы».
11 А тым, што слухалі гэтае, працягваючы, сказаў прыповесьць, бо Ён быў блізка Ерусаліму, і
яны думалі, што адразу маюць убачыць Валадарства Божае.
12 Тады Ён сказаў: «Нейкі чалавек высокага роду пайшоў у далёкі край узяць сабе валадарства
і вярнуцца.
13 Паклікаўшы ж дзесяць слугаў сваіх, даў ім дзесяць мінаў і сказаў ім: "Гандлюйце, пакуль
прыйду".
14 А грамадзяне ненавідзелі яго і паслалі сьледам за ім пасольства, кажучы: "Ня хочам, каб
гэты валадарыў над намі".
15 І сталася, як ён вярнуўся, атрымаўшы валадарства, сказаў паклікаць да сябе слугаў тых, якім
даў срэбра, каб даведацца, хто што зарабіў.
16 І прыйшоў першы, кажучы: "Пане! Міна твая прынесла дзесяць мінаў".
17 І ён сказаў яму: "Добра, добры слуга! За тое, што ты ў малым быў верны, будзеш мець уладу
над дзесяцьцю гарадамі".
18 І прыйшоў другі, кажучы: "Пане! Міна твая зарабіла пяць мінаў".
19 Сказаў і гэтаму: "І ты будзь над пяцьцю гарадамі".
20 І трэці прыйшоў, кажучы: "Пане! Вось твая міна, якую я меў, завязаўшы ў хустку,
21 бо я баяўся цябе, што ты чалавек строгі, бярэш тое, што не лажыў, і жнеш тое, што ня сеяў".
22 Той жа кажа яму: "Паводле вуснаў тваіх буду судзіць цябе, злы слуга. Ты ведаў, што я —
чалавек строгі, бяру тое, што не лажыў, і жну тое, што ня сеяў.

23 Чаму ж ты не аддаў срэбра майго на стол [купцам], і я, прыйшоўшы, атрымаў бы яго з прыбыткам?”
24 І сказаў тым, што побач стаялі: “Вазьміце ў яго міну і дайце таму, які мае дзесяць мінаў”.
25 І сказалі яму: “Пане, ён мае дзесяць мінаў!”
26 “Кажу вам, што ўсякаму, хто мае, дадзена будзе, а ў таго, хто ня мае, будзе забрана і тое, што мае.
27 А ворагаў маіх, тых, што не хацелі, каб я валадарыў над імі, прывядзіце сюды і страцьце перада мною”».
28 І, сказаўшы гэтае, Ён пайшоў далей, узыходзячы ў Ерусалім.
29 І сталася, калі наблізіўся да Бэтфагі і Бэтаніі, да гары, якую называюць Аліўнай, паслаў двух вучняў Сваіх,
30 сказаўшы: «Ідзіце ў мястэчка, што перад вамі, у якім, увайшоўшы, знойдзеце асьляня прывязанае, на якога ніхто з людзей ніколі не сядаў; адвязаўшы яго, прывядзіце.
31 І калі хто спытаецца ў вас: “Навошта адвязваеце?”, — скажыце яму так: “Госпад патрабуе яго”».
32 Пайшоўшы, пасланыя знайшлі, як Ён сказаў ім.
33 Калі ж яны адвязвалі асьляня, гаспадары ягоныя сказалі ім: «Навошта адвязваеце асьляня?»
34 Яны ж сказалі: «Госпад патрабуе яго».
35 І прывялі яго да Ісуса, і, накінуўшы адзеньні свае на асьляня, пасадзілі на яго Ісуса.
36 І, калі Ён ехаў, пасьцілалі на дарозе адзеньне сваё.
37 Калі ж Ён наблізіўся да спуску з гары Аліўнай, усё мноства вучняў з радасьцю хваліла Бога моцным голасам за ўсе цуды, якія яны бачылі,
38 кажучы: «Дабраслаўлёны Валадар, Які ідзе ў імя Госпада! Супакой на небе і слава на вышынях!»
39 І некаторыя фарысэі з натоўпу сказалі Яму: «Настаўнік! Забарані вучням Тваім!»
40 І, адказваючы, Ён сказаў ім: «Кажу вам, што, калі яны замоўкнуць, дык камяні закрычаць».
41 І калі наблізіўся, убачыўшы горад, заплакаў па ім,
42 кажучы: «Каб і ты хоць у гэты дзень твой зразумеў, што дзеля супакою твайго! Але цяпер гэта схавана ад вачэй тваіх.
43 Бо прыйдуць на цябе дні, і ворагі твае аточаць цябе валам, і акружаць цябе, і сьціснуць цябе адусюль,
44 і зьнішчаць дашчэнту цябе, і дзяцей тваіх у табе, і не пакінуць у табе камяня на камяні дзеля таго, што не зразумеў ты час адведзінаў тваіх».
45 І, увайшоўшы ў сьвятыню, пачаў выганяць тых, якія продалі ў ёй і куплялі,
46 кажучы ім: «Напісана: “Дом Мой ёсьць дом малітвы”, а вы зрабілі яго пячорай разбойнікаў».
47 І навучаў кожны дзень у сьвятыні. А першасьвятары, і кніжнікі, і першыя ў народзе шукалі, як загубіць Яго,
48 і не знаходзілі, што зрабіць, бо ўвесь народ гарнуўся да Яго, слухаючы Яго.

Лк 20

1 І сталася, калі ў адзін з тых дзён Ён навучаў народ у сьвятыні і дабравесьціў, прыйшлі першасьвятары і кніжнікі са старшынямі
2 і сказалі Яму, кажучы: «Скажы нам, якою ўладаю Ты гэтае робіш, ці хто даў Табе ўладу гэтую?»
3 Адказваючы, Ён сказаў ім: «Спытаюся і Я ў вас адно слова, і скажыце Мне:
4 Хрышчэньне Янава з неба было ці ад людзей?»
5 Яны ж разважалі між сабою, кажучы: «Калі скажам: “З неба”, — Ён скажа: “Чаму тады вы не паверылі яму?”
6 А калі скажам: “Ад людзей”, — увесь народ паб’е нас камянямі, бо ён упэўнены, што Ян — гэта прарок».
7 І адказалі: «Ня ведаем адкуль».
8 І сказаў ім Ісус: «Тады Я не скажу вам, якою ўладаю гэта раблю».

9 Пачаў жа Ён гаварыць да народу гэткую прыповесьць: «Адзін чалавек пасадзіў вінаграднік, і
здаў яго вінаградарам, і выехаў на доўгі час.
10 І ў свой час паслаў да вінаградараў слугу, каб яны далі яму пладоў з вінаградніку, але
вінаградары, зьбіўшы яго, адаслалі ні з чым.
11 Яшчэ паслаў іншага слугу; але яны і гэтага, зьбіўшы і зьняважыўшы, адаслалі ні з чым.
12 Яшчэ паслаў трэцяга; але яны і таго, зраніўшы, выгналі.
13 І сказаў гаспадар вінаградніку: “Што мне рабіць? Пашлю сына майго ўлюбёнага. Можа,
убачыўшы яго, пасаромеюцца”.
14 Убачыўшы ж яго, вінаградары разважалі між сабою, кажучы: “Гэта спадкаемца; пойдзем,
заб’ем яго, каб нашаю сталася спадчына”.
15 І, выгнаўшы яго вон з вінаградніку, забілі. Дык што зробіць з імі гаспадар вінаградніку?
16 Прыйдзе і выгубіць вінаградараў гэтых, і аддасьць вінаграднік другім». Тыя, што чулі гэтае,
сказалі: «Няхай ня станецца!»
17 А Ён, глянуўшы на іх, сказаў: «Што тады значыць тое, што напісана: “Камень, які адкінулі
будаўнікі, стаўся галавой вугла”?
18 Усякі, хто ўпадзе на гэты камень, разаб’ецца, а на каго ён упадзе, таго раздушыць».
19 І шукалі ў гэтую гадзіну першасьвятары і кніжнікі, каб налажыць на Яго рукі, але баяліся
народу, бо зразумелі, што пра іх сказаў Ён гэтую прыповесьць.
20 І, сочачы за Ім, паслалі шпегаў, якія ўдавалі сябе за праведнікаў, каб яны падлавілі Яго на
слове, каб выдаць Яго начальству і ўладзе ваяводы.
21 І тыя спыталіся ў Яго, кажучы: «Настаўнік! Мы ведаем, што Ты слушна гаворыш і навучаеш,
і не глядзіш на аблічча, але паводле праўды шляху Божаму навучаеш.
22 Ці належыцца плаціць падатак цэзару, ці не?»
23 А Ён, бачачы подступ іхні, сказаў ім: «Чаму вы Мяне спакушаеце?
24 Пакажыце Мне дынар. Чый на ім вобраз і надпіс?» Яны, адказваючы, сказалі: «Цэзараў».
25 Ён жа сказаў ім: «Дык аддавайце тое, што цэзарава, цэзару, а што Божае, — Богу».
26 І не маглі падлавіць Яго на слове перад народам, і, зьдзівіўшыся адказу Ягонаму, замоўклі.
27 Прыйшоўшы ж, некаторыя з садукеяў, якія пярэчаць, што ёсьць уваскрасеньне, спыталіся ў
Яго,
28 кажучы: «Настаўнік! Майсей напісаў нам: “Калі памрэ нечый брат, які меў жонку, і памрэ
бязьдзетным, дык брат ягоны мае ўзяць жонку ягоную і аднавіць насеньне брату свайму”.
29 Было сем братоў; і першы, узяўшы жонку, памёр бязьдзетным.
30 І ўзяў другі тую жанчыну, і той памёр бязьдзетным.
31 І трэці ўзяў яе, і таксама ўсе сем, і не пакінулі дзяцей, і памерлі.
32 Пасьля ўсіх памерла і жанчына.
33 Дык пры ўваскрасеньні каторага з іх будзе яна жонкаю? Бо сямёра мелі яе за жонку».
34 І адказваючы, сказаў ім Ісус: «Сыны веку гэтага жэняцца і выходзяць замуж;
35 а тыя, якія вартыя дасягнуць таго веку і ўваскрасеньня з мёртвых, ня жэняцца і замуж не
выходзяць,
36 бо памерці ўжо ня могуць, бо яны роўныя анёлам і сыны Божыя, калі сталіся сынамі
ўваскрасеньня.
37 А што мёртвыя ўваскрэснуць, і Майсей паказаў каля глогу, калі назваў Госпада Богам
Абрагама, і Богам Ісаака, і Богам Якуба.
38 Ён ня ёсьць Бог мёртвых, але жывых, бо ў Яго ўсе жывыя».
39 Адказваючы, некаторыя з кніжнікаў сказалі: «Настаўнік! Ты добра сказаў».
40 І ўжо не адважваліся ні пра што пытацца ў Яго. Ён жа сказаў ім:
41 «Чаму кажуць, што Хрыстос ёсьць Сын Давіда?
42 А сам Давід кажа ў кнізе псальмаў: “Сказаў Госпад Госпаду майму: "Сядзь праваруч Мяне,
43 пакуль пакладу ворагаў Тваіх як падножжа ног Тваіх"”.
44 Дык Давід называе Яго Госпадам, і як жа Ён — сын ягоны?»

45 І калі ўвесь народ слухаў, Ён сказаў вучням Сваім:
46 «Сьцеражыцеся кніжнікаў, якія хочуць хадзіць у доўгіх шатах, і любяць вітаньні на рынках,
і першыя месцы ў сынагогах і ўзьлягаць на першых месцах на вячэрах,
47 якія аб'ядаюць дамы ўдоваў і дзеля віду доўга моляцца. Яны атрымаюць цяжэйшы прысуд».

Лк 21

1 Глянуўшы ж, убачыў Ён багацеяў, якія кідалі дары свае ў скарбніцу.
2 І ўбачыў адну бедную ўдаву, якая кінула туды дзьве лепты,
3 і сказаў: «Сапраўды кажу вам, што гэтая бедная ўдава кінула больш за ўсіх,
4 бо ўсе тыя з лішку свайго кідалі ў дар Богу, а яна з нястачы сваёй кінула ўсё ўтрыманьне сваё,
якое мела».
5 І, калі некаторыя гаварылі пра сьвятыню, што яна аздоблена каштоўнымі камянямі і дарамі,
Ён сказаў:
6 «Прыйдуць дні, калі з таго, што вы тут бачыце, не застанецца камяня на камяні, які б ня быў
зруйнаваны».
7 Спыталіся ж у Яго, кажучы: «Настаўнік! Калі ж гэта мае быць? І які знак, калі гэта мае
стацца?»
8 Ён жа сказаў: «Глядзіце, каб вас не падманулі, бо многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы,
што гэта Я, і гэты час наблізіўся. Не хадзіце за імі.
9 Калі ж пачуеце пра войны і бязладзьдзе, не жахайцеся, бо гэта мусіць стацца спачатку, але
не адразу канец».
10 Тады сказаў ім: «Паўстане народ на народ, і валадарства на валадарства,
11 А месцамі будуць вялікія землятрусы, і голад, і пошасьць, таксама страхі і знакі з неба
вялікія будуць.
12 А перад усім гэтым ускладуць на вас рукі і будуць перасьледаваць вас, выдаючы ў сынагогі
і вязьніцы, ведучы да валадароў і ваяводаў дзеля імя Майго.
13 А станецца гэта дзеля сьведчаньня вам.
14 Дык палажыце ў сэрцах вашых не абдумваць раней, як адказваць,
15 бо Я дам вам вусны і мудрасьць, якой ня здолеюць ані пярэчыць, ані супрацьстаяць усе
супраціўнікі вашыя.
16 А будзеце выдадзеныя і бацькамі, і братамі, і сваякамі, і сябрамі; і некаторых з вас
пазабіваюць,
17 і будуць ненавідзець вас усе дзеля імя Майго,
18 але і волас з галавы вашай не прападзе.
19 У цярплівасьці вашай здабывайце душы вашыя.
20 Калі ж убачыце Ерусалім, акружаны войскам, тады разумейце, што наблізілася
спусташэньне яго.
21 Тады тыя, хто ў Юдэі, няхай бягуць у горы; і тыя, хто пасярод гораду, няхай выходзяць; і
тыя, хто ў ваколіцы, няхай не ўваходзяць у яго,
22 бо гэта дні помсты, каб споўнілася ўсё напісанае.
23 Гора ж тым, якія цяжарныя і якія кормяць грудзьмі, у тыя дні; бо будзе вялікае бедства на
зямлі і гнеў на народзе гэтым.
24 І ўпадуць ад вострыва мяча, і павядуць іх у палон да ўсіх паганскіх народаў, і Ерусалім
будуць таптаць пагане, пакуль ня скончацца часы паганаў.
25 І будуць знакі на сонцы, і месяцы, і зорках, і на зямлі ўціск народаў у зьбянтэжанасьці, як
зараве і забушуе мора.
26 І дрантвець будуць людзі ад страху і чаканьня таго, што прыйдзе на сусьвет, бо сілы
нябесныя захістаюцца.
27 І тады ўгледзяць Сына Чалавечага, Які прыходзіць у воблаку з моцаю і славаю вялікаю.
28 Калі ж пачне гэтае дзеяцца, выпрастуйцеся і падніміце галовы вашыя, таму што
набліжаецца адкупленьне вашае».

29 І сказаў ім прыповесьць: «Глядзіце на фігавае дрэва і на ўсе дрэвы:
30 калі яны ўжо распускаюцца, убачыўшы, разумееце самі, што ўжо блізка лета.
31 Гэтак і вы, як убачыце, што гэтае стаецца, разумейце, што блізка ёсьць Валадарства Божае.
32 Сапраўды кажу вам: не праміне пакаленьне гэтае, як усё гэта станецца.
33 Неба і зямля прамінуць, але словы Мае не прамінуць.
34 Пільнуйце ж самі сябе, каб сэрцы вашыя не былі абцяжараныя абжорствам, і п'янствам, і клопатамі жыцьцёвымі, і каб дзень той не прыйшоў да вас неспадзявана.
35 Бо ён, як пастка, спадзе на ўсіх, што жывуць на абліччы ўсёй зямлі.
36 Дык чувайце, молячыся ў-ва ўсякі час, каб вам быць вартымі ўцячы ад усяго, што мае стацца, і стаць перад Сынам Чалавечым».
37 Удзень Ён навучаў у сьвятыні; а ночы, выходзячы, праводзіў на гары, называнай Аліўнай.
38 І ўвесь народ з раніцы прыходзіў да Яго ў сьвятыню слухаць Яго.

Лк 22

1 Набліжалася ж сьвята праснакоў, называнае Пасха.
2 І шукалі першасьвятары і кніжнікі, як забіць Яго, бо баяліся народу.
3 А шатан увайшоў у Юду, называнага Іскарыётам, аднаго з ліку Дванаццаці,
4 і той, адыйшоўшы, гутарыў з першасьвятарамі і начальнікамі варты, як Яго выдаць ім.
5 І яны ўзрадаваліся, і дамовіліся даць яму грошы,
6 і ён абяцаў, і шукаў нагоды, каб выдаць Яго ім не пры натоўпе.
7 Прыйшоў жа дзень праснакоў, калі мусілі рэзаць пасхальнае [ягня].
8 І паслаў [Ісус] Пятра і Яна, сказаўшы: «Ідзіце, падрыхтуйце нам есьці Пасху».
9 Яны ж сказалі Яму: «Дзе хочаш, каб мы прыгатавалі?»
10 Ён жа сказаў ім: «Вось, пры ўваходзе вашым у горад, сустрэнецца вам чалавек, які нясе збан вады. Ідзіце за ім у дом, у які ён увойдзе,
11 і скажыце гаспадару дому: "Настаўнік гаворыць табе: 'Дзе сьвятліца, у якой буду есьці Пасху з вучнямі Маімі?' "
12 І ён пакажа вам залю вялікую, засланую; там падрыхтуйце».
13 Пайшоўшы ж, яны знайшлі, як Ён сказаў ім, і падрыхтавалі Пасху.
14 І калі прыйшла гадзіна, Ён узьлёг, і дванаццаць апосталаў з Ім.
15 І Ён сказаў ім: «Жаданьнем жадаю Я есьці з вамі гэтую Пасху перш, чым маю цярпець [пакуты].
16 Бо кажу вам, што ўжо ня буду есьці яе, пакуль ня споўніцца ў Валадарстве Божым».
17 І, узяўшы келіх, падзякаваўшы, сказаў: «Вазьміце гэта і падзяліце паміж сабою,
18 бо кажу вам, што ня буду піць ад плоду вінаграднага, пакуль ня прыйдзе Валадарства Божае».
19 І, узяўшы хлеб, падзякаваўшы, паламаў і даў ім, кажучы: «Гэта ёсьць Цела Маё, Якое за вас даецца. Рабіце гэта на ўспамін пра Мяне».
20 Гэтаксама і келіх [узяў] пасьля вячэры, кажучы: «Гэта келіх Новага Запавету ў Крыві Маёй, якая за вас праліваецца.
21 Але вось, рука таго, хто выдае Мяне, са Мною за сталом.
22 І, сапраўды, Сын Чалавечы ідзе паводле таго, як вызначана, але гора таму чалавеку, які Яго выдае».
23 І яны пачалі пытацца адзін у аднаго, хто гэта з іх меўся зрабіць гэта.
24 Узьнялася ж і спрэчка між імі, хто з іх лічыцца большым.
25 Ён жа сказаў ім: «Валадары народаў пануюць над імі, і тыя, што маюць над імі ўладу, дабрадзеямі называюцца.
26 Вы ж ня гэтак, але большы сярод вас стання як меншы, і правадыр — як служыцель.
27 Бо хто большы: той, які ўзьлягае за сталом, ці той, які паслугуе? Ці ня той, які ўзьлягае? А Я сярод вас, як той, які паслугуе.
28 Вы ж тыя, хто застаецца са Мною ў спакусах Маіх,

29 і Я пераказваю вам Валадарства, як Мне пераказаў Айцец Мой,
30 каб вы елі і пілі за сталом Маім у Валадарстве Маім; і сядзелі на пасадах, судзячы дванаццаць
каленаў Ізраіля».
31 І сказаў Госпад: «Сымоне, Сымоне! Вось, шатан зажадаў прасейваць вас, як пшаніцу,
32 а Я маліўся за цябе, каб не паменшала вера твая; і ты, некалі павярнуўшыся, умацуй братоў
тваіх».
33 Той жа адказаў Яму: «Госпадзе! З Табою я гатовы ісьці і ў вязьніцу, і на смерць!»
34 Ён жа сказаў: «Кажу табе, Пётар, не прапяе певень сёньня, як ты тройчы адрачэшся, што
ведаеш Мяне».
35 І сказаў ім: «Калі Я пасылаў вас бяз кайстры, і бяз торбы, і без абутку, ці мелі вы нейкую
нястачу?» Яны адказалі: «Аніякай».
36 Тады Ён сказаў ім: «Але цяпер, хто мае кайстру, няхай возьме таксама і торбу, і хто ня мае,
няхай прадасьць адзеньне сваё і купіць меч.
37 Бо кажу вам, што мусіць зьдзейсьніцца на Мне ўсё гэта, што напісана: “І да беззаконьнікаў
залічаны”. Бо ўсяму, што адносна Мяне, надыходзіць канец».
38 Яны ж сказалі: «Госпадзе! Вось, тут два мячы!» А Ён сказаў ім: «Даволі!»
39 І, выйшаўшы, пайшоў, як звычайна, на гару Аліўную; а за Ім пайшлі і вучні Ягоныя.
40 Прыйшоўшы ж на месца, Ён сказаў ім: «Маліцеся, каб не ўвайсьці ў спакусу».
41 І Ён адыйшоў ад іх як кінуць камень, і, укленчыўшы, маліўся,
42 кажучы: «Ойча, калі хочаш, пранясі келіх гэты міма Мяне. Аднак не Мая воля, але Твая
няхай станецца».
43 Зьявіўся ж Яму анёл з неба, умацоўваючы Яго.
44 І, будучы ў барацьбе сьмяротнай, пільней маліўся, а быў пот Ягоны, як кроплі крыві, што
падалі на зямлю.
45 І, устаўшы ад малітвы, Ён прыйшоў да вучняў і знайшоў іх, што яны сьпяць ад смутку.
46 І сказаў ім: «Што вы сьпіцё? Устаньце, маліцеся, каб не ўвайсьці ў спакусу».
47 Яшчэ Ён гаварыў, аж вось натоўп, а наперадзе іх ішоў адзін з Дванаццаці, называны Юда, і
ён наблізіўся да Ісуса, каб пацалаваць Яго.
48 Ісус жа сказаў яму: «Юда! Пацалункам Сына Чалавечага выдаеш?»
49 А тыя, якія былі з Ім, бачачы, што мае стацца, сказалі Яму: «Госпадзе! Ці ня ўдарыць
мячом?»
50 І адзін з іх ударыў слугу першасьвятара, і адсек яму правае вуха.
51 Адказваючы ж, Ісус сказаў: «Пакіньце гэта». І, дакрануўшыся да вуха ягонага, аздаравіў яго.
52 А першасьвятарам, і начальнікам варты сьвятыні, і старшыням, якія прыйшлі супраць Яго,
сказаў Ісус: «Быццам на разбойніка выйшлі вы з мячамі і каламі.
53 Кожны дзень, калі быў Я з вамі ў сьвятыні, вы ня выцягнулі на Мяне руку, але гэта вашая
гадзіна і ўлада цемры».
54 Схапіўшы Яго, яны павялі [Яго], і прыйшлі ў дом першасьвятара. А Пётар ішоў за Ім здалёк.
55 Калі ж распалілі агонь сярод панадворку і паселі разам, сядзеў і Пётар сярод іх.
56 Убачыўшы ж яго, нейкая служка, якая сядзела ля сьвятла і прыглядалася да яго, сказала: «І
гэты быў з Ім».
57 Ён жа адрокся ад Яго, кажучы: «Жанчына! Я ня ведаю Яго».
58 І неўзабаве іншы, убачыўшы яго, сказаў: «І ты з іх». А Пётар сказаў: «Чалавеча! Ня я гэта».
59 І, калі прайшло каля адной гадзіны, нехта іншы настойваў, кажучы: «Праўда, і гэты быў з
Ім, бо ён — Галілеец».
60 А Пётар сказаў: «Чалавеча, ня ведаю, што ты гаворыш». І тады, калі ён яшчэ гаварыў, запяяў
певень.
61 І павярнуўшыся, Госпад паглядзеў на Пятра, і ўзгадаў Пётар слова Госпада, як Ён сказаў яму:
«Перш, чым прапяе певень, тройчы адрачэшся ад Мяне».
62 І, выйшаўшы вон, Пётар горка заплакаў.
63 І мужчыны, якія трымалі Ісуса, зьдзекваліся з Яго, зьбіваючы.

64 І, засланіўшы Яго, білі Яго па абліччы, і пыталіся ў Яго: «Прароч, хто ўдарыў Цябе?»
65 І шмат іншага, блюзьнячы, гаварылі на Яго.
66 І калі настаў дзень, сабраліся старшыні народу, першасьвятары і кніжнікі, і прывялі Яго ў свой сынэдрыён,
67 кажучы: «Ці Ты — Хрыстос? Скажы нам». Ён жа сказаў ім: «Калі скажу вам, вы не паверыце.
68 Калі ж Я спытаюся, не адкажаце Мне і ня вызваліце.
69 Ад цяпер Сын Чалавечы сядзе праваруч моцы Божай».
70 А ўсе сказалі: «Дык Ты — Сын Божы?» Ён жа прамовіў ім: «Вы кажаце, што Я».
71 Яны ж сказалі: «Якое яшчэ патрэбна нам сьведчаньне? Бо мы самі чулі з вуснаў Ягоных».

Лк 23

1 І, падняўшыся, усё мноства іх павяло Яго да Пілата.
2 І пачалі абвінавачваць Яго, кажучы: «Гэтага знайшлі мы, што Ён псуе народ і забараняе плаціць падаткі цэзару, называючы Сябе Хрыстом Валадаром».
3 А Пілат спытаўся ў Яго, кажучы: «Ты — Валадар Юдэйскі?» Ён жа, адказваючы яму, прамовіў: «Ты кажаш».
4 А Пілат сказаў першасьвятарам і натоўпам: «Я не знаходжу аніякае віны ў гэтым Чалавеку».
5 А яны настойвалі, кажучы, што Ён падбухторвае народ, навучаючы па ўсёй Юдэі, пачынаючы ад Галілеі аж дасюль.
6 Пілат, пачуўшы пра Галілею, спытаўся: «Ці ж гэты Чалавек — Галілеец?»
7 І, даведаўшыся, што Ён з-пад улады Ірада, паслаў Яго да Ірада, які ў тыя дні быў у Ерусаліме.
8 А Ірад, убачыўшы Ісуса, вельмі ўзрадаваўся, бо даўно хацеў убачыць Яго, бо шмат чуў пра Яго і спадзяваўся ўбачыць нейкі знак, які Ён учыніць.
9 І пытаўся ў Яго шматлікімі словамі, а Ён нічога не адказваў яму.
10 А першасьвятары і кніжнікі стаялі, заўзята абвінавачваючы Яго.
11 Ірад жа з жаўнерамі сваімі, пагардзіўшы Ім і пазьдзекваўшыся з Яго, апрануў Яго ў сьветлае адзеньне і паслаў Яго да Пілата.
12 І сталіся ў той дзень Пілат і Ірад сябрамі, бо раней мелі варожасьць між сабою.
13 Пілат жа, склікаўшы першасьвятароў, і начальнікаў, і народ,
14 сказаў ім: «Вы прывялі да мяне Чалавека гэтага, як таго, хто адварочвае [ад уладаў] народ. І вось я, пры вас дапытаўшы, не знайшоў у Чалавеку гэтым аніякай віны, у якой вы Яго абвінавачваеце.
15 І таксама Ірад [нічога не занйшоў], бо я пасылаў вас да яго. І вось, нічога ня знойдзена ў Ім, вартага сьмерці.
16 Таму, пакараўшы Яго, я вызвалю [Яго]».
17 А яму трэба было на сьвята вызваліць ім аднаго [вязьня].
18 А ўсё мноства закрычала, кажучы: «Вазьмі Яго! А нам вызвалі Бараббу!»
19 А той быў кінуты ў вязьніцу за паўстаньне, якое ён учыніў у горадзе, і забойства.
20 Тады Пілат ізноў прамовіў, хочучы вызваліць Ісуса.
21 А яны крычалі, кажучы: «Укрыжуй, укрыжуй Яго!»
22 Ён жа трэці раз сказаў ім: «Якое зло Ён учыніў? Аніякай сьмяротнай віны я не знайшоў у Ім; дык пакараўшы Яго, вызвалю».
23 Яны ж дамагаліся моцным голасам, просячы, каб Яго ўкрыжавалі. І перамаглі галасы іхнія і першасьвятароў.
24 І Пілат прысудзіў, каб сталася паводле просьбы іхняй:
25 вызваліў ім таго, хто за паўстаньне і забойства быў кінуты ў вязьніцу, якога яны прасілі, а Ісуса выдаў на іх волю.
26 І калі вялі Яго, узяўшы нейкага Сымона Кірэнэйца, які ішоў з поля, усклалі на яго крыж, каб нёс за Ісусам.
27 А за Ім ішло вялікае мноства народу і жанчынаў, якія плакалі і галасілі па Ім.

28 Ісус жа, павярнуўшыся да іх, сказаў: «Дочкі Ерусалімскія! Ня плачце па Мне, але плачце па
сабе і па дзецях вашых,
29 бо вось прыходзяць дні, калі скажуць: “Шчасьлівыя няплодныя, і чэравы, якія не нараджалі,
і грудзі, якія не кармілі”.
30 Тады пачнуць гаварыць гарам: “Упадзіце на нас!”, і ўзгоркам: “Прыкрыйце нас!”
31 Бо калі з зялёным дрэвам гэтае робяць, дык з сухім што станецца?»
32 Вялі ж з Ім на сьмерць і двух іншых злачынцаў.
33 І калі прыйшлі на месца, называнае Чараповае, там укрыжавалі Яго і злачынцаў, аднаго з
правага, а другога — з левага боку.
34 Ісус жа сказаў: «Ойча, даруй ім, бо ня ведаюць, што робяць». А тыя, што дзялілі шаты
Ягоныя, кінулі жэрабя.
35 І стаяў народ, гледзячы. А разам з імі насьміхаліся і начальнікі, кажучы: «Другіх збаўляў,
няхай жа Сябе Самога збавіць, калі Ён — Хрыстос, Выбранец Божы».
36 Зьдзекваліся з Яго і жаўнеры, падыходзячы, і прыносячы Яму воцат,
37 і кажучы: «Калі Ты — Валадар Юдэйскі, збаў Сябе Самога».
38 І быў над Ім надпіс, напісаны пісаньнямі грэцкімі, рымскімі і гебрайскімі: «Гэта — Валадар
Юдэйскі».
39 Адзін з павешаных злачынцаў блюзьніў на Яго, кажучы: «Калі Ты — Хрыстос, збаў Сябе і
нас».
40 Адказваючы, другі забараняў яму, кажучы: «Ці ж ты не баішся Бога, бо і сам маеш такі самы
прысуд?
41 І мы сапраўды [асуджаны] справядліва, бо атрымалі вартае таго, што мы зрабілі, а Ён нічога
благога не зрабіў».
42 І сказаў Ісусу: «Узгадай пра мяне, Госпадзе, калі прыйдзеш у Валадарства Тваё!»
43 І сказаў яму Ісус: «Сапраўды кажу табе: сёньня будзеш са Мною ў раі».
44 А было каля шостае гадзіны, і сталася цемра па ўсёй зямлі да гадзіны дзявятае,
45 і зацьмілася сонца, і заслона ў бажніцы была разьдзёртая пасярэдзіне.
46 І ўсклікнуўшы моцным голасам, Ісус сказаў: «Ойча, у рукі Твае аддаю Дух Мой». І, сказаўшы
гэтае, аддаў духа.
47 Сотнік жа, убачыўшы ўсё, што сталася, праславіў Бога, кажучы: «Праўдзіва, Чалавек гэты
быў праведнік».
48 І ўвесь натоўп, які зграмадзіўся на гэта відовішча, бачачы, што здарылася, варочаўся, б’ючы
сябе ў грудзі.
49 А ўсе знаёмыя з Ім і жанчыны, якія ішлі за Ім з Галілеі, стаялі здалёк, гледзячы на гэта.
50 І вось чалавек на імя Язэп, які быў ратманам, чалавек добры і праведны,
51 які не згаджаўся з радай і ўчынкам іхнім, з Арыматэі, гораду Юдэйскага, які таксама чакаў
Валадарства Божага,
52 прыйшоўшы да Пілата, прасіў цела Ісуса,
53 і, зьняўшы Яго [з крыжа], абкруціў палатнінаю і палажыў Яго ў магіле, якая была высечаная
ў скале, дзе яшчэ ніхто ня быў пахованы.
54 Дзень быў днём прыгатаваньня, і надыходзіла субота.
55 І жанчыны, што былі прыйшоўшы з Ім з Галілеі, пайшлі глядзець магілу і як было пакладзена
цела Ягонае.
56 А вярнуўшыся, падрыхтавалі духмянасьці і міра. І ў суботу супачывалі паводле
прыказаньня.

Лк 24

1 А ў першы дзень пасьля суботы вельмі рана прыйшлі яны да магілы, несучы падрыхтаваныя
духмянасьці, і разам з імі некаторыя другія.
2 І знайшлі камень, адвалены ад магілы.
3 І ўвайшоўшы, не знайшлі цела Госпада Ісуса.

4 І сталіся яны зьбянтэжаныя ад гэтага, і вось, сталі перад імі два мужы ў бліскучым адзеньні.
5 Калі ў страху схілілі яны абліччы да зямлі, тыя сказалі ім: «Што вы шукаеце жывога сярод мёртвых?
6 Яго няма тут, але Ён уваскрос. Узгадайце, што Ён казаў вам, калі быў яшчэ ў Галілеі,
7 кажучы, што Сын Чалавечы мусіць быць выдадзены ў рукі людзей грэшных, і быць укрыжаваным, і на трэці дзень уваскрэснуць».
8 І ўзгадалі яны словы Ягоныя.
9 І, вярнуўшыся ад магілы, паведамілі пра гэта ўсім Адзінаццаці і ўсім іншым.
10 А былі гэта Марыя Магдалена, і Яанна, і Марыя Якубава, і іншыя з імі, што сказалі пра гэта апосталам.
11 І падаліся ім словы іхнія пустымі, і не паверылі ім.
12 А Пётар, устаўшы, пабег да магілы і, нахіліўшыся, бачыць прасьціну, што ляжала асобна, і адыйшоў, зьдзіўляючыся ў сабе з таго, што сталася.
13 І вось, у той жа дзень двое з іх ішлі ў мястэчка, што на адлегласьці ў шэсьцьдзясят стадыяў ад Ерусаліму, называнае Эмаус.
14 І яны гутарылі між сабою пра ўсе гэтыя здарэньні.
15 І сталася, калі яны гутарылі і разважалі між сабою, вось, Сам Ісус, падыйшоўшы, пайшоў з імі.
16 Вочы ж іхнія былі стрыманыя, дык не пазналі Яго.
17 Ён жа сказаў ім: «Што гэта за словы вы гаворыце між сабою, ідучы, і чаму вы панурыя?»
18 Адказваючы, адзін з іх, на імя Кляопа, сказаў Яму: «Ці ты адзін з вандроўнікаў у Ерусаліме і ня ведаеш, што сталася ў ім у гэтыя дні?»
19 І Ён сказаў ім: «Што?» Яны ж сказалі Яму: «Пра Ісуса з Назарэту, Які быў прарок, магутны ў справе і слове перад Богам і ўсім народам;
20 як выдалі Яго першасьвятары і начальнікі нашыя на прысуд сьмяротны і ўкрыжавалі Яго?
21 А мы спадзяваліся, што Ён ёсьць Той, Які мае адкупіць Ізраіль. Але да ўсяго гэтага вось ужо трэці дзень сёньня, як тое сталася.
22 Але некаторыя жанчыны з нашых зьдзівілі нас: быўшы раніцай ля магілы
23 і не знайшоўшы цела Ягонага, яны прыйшлі, кажучы, што ўгледзелі відзеж анёлаў, якія кажуць, што Ён жывы.
24 І пайшлі некаторыя з нашых да магілы, і знайшлі так, як і казалі жанчыны, а Яго ня бачылі».
25 І Ён сказаў ім: «О, бяздумныя і павольныя сэрцам, каб верыць усяму, што гаварылі прарокі!
26 Ці ж ня гэтак трэба было цярпець Хрысту і ўвайсьці ў славу Сваю?»
27 І, пачаўшы ад Майсея і ўсіх прарокаў, тлумачыў ім усё, што напісана пра Яго.
28 І наблізіліся яны да таго мястэчка, куды ішлі; і Ён паказаў, што ідзе далей.
29 І яны затрымлівалі Яго, кажучы: «Застанься з намі, бо дзень ужо схіліўся да вечара». І Ён увайшоў, каб застацца з імі.
30 І сталася, калі Ён узьлягаў разам з імі, Ён, узяўшы хлеб, дабраславіў, паламаў і даў ім.
31 І адчыніліся вочы іхнія, і яны пазналі Яго, а Ён стаўся нябачным для іх.
32 І казалі яны адзін аднаму: «Ці ж не гарэла ў нас сэрца нашае, калі Ён гаварыў да нас у дарозе і калі адчыняў нам Пісаньне?»
33 І, устаўшы ў тую ж гадзіну, вярнуліся ў Ерусалім, і знайшлі разам Адзінаццаць і тых, што з імі,
34 якія гаварылі, што Госпад сапраўды ўваскрос і зьявіўся Сымону.
35 І яны распавялі, што здарылася ў дарозе, і як пазналі Яго ў ламаньні хлеба.
36 Калі ж яны гэтак гаварылі, Сам Ісус стаў сярод іх і кажа ім: «Супакой вам!»
37 Яны, жахнуўшыся і спалохаўшыся, падумалі, што бачаць духа.
38 І Ён сказаў ім: «Што вы стрывожыліся? І чаму такія думкі ўваходзяць у сэрцы вашыя?
39 Паглядзіце на рукі Мае і на ногі Мае, бо гэта Я Сам. Дакраніцеся да Мяне і пабачце, бо дух цела і костак ня мае, што, як бачыце, Я маю».
40 І, сказаўшы гэтае, паказаў ім рукі і ногі.

41 Калі ж яны ад радасьці яшчэ ня верылі і зьдзіўляліся, Ён сказаў ім: «Ці маеце тут якую ежу?»
42 Яны ж далі Яму частку печанай рыбы і сотавага мёду.
43 І, узяўшы, Ён еў перад імі.
44 І сказаў ім: «Вось тыя словы, якія Я гаварыў вам, калі яшчэ быў з вамі, што мусіць споўніцца
ўсё, што напісана пра Мяне ў Законе Майсея, і ў Прарокаў, і ў Псальмах».
45 Тады адчыніў ім розум дзеля разуменьня Пісаньня.
46 І сказаў ім: «Так напісана і так належала цярпець Хрысту, і ўваскрэснуць з мёртвых на трэці
дзень.
47 І будзе абвешчана ў імя Ягонае навяртаньне і адпушчэньне грахоў у-ва ўсіх народах,
пачынаючы ад Ерусаліму.
48 А вы — сьведкі гэтага.
49 І вось, Я пасылаю абяцаньне Айца Майго на вас. Вы ж заставайцеся ў горадзе Ерусаліме,
пакуль не апранецеся моцаю звыш».
50 І вывеў іх вонкі да Бэтаніі, і, падняўшы рукі Свае, дабраславіў іх.
51 І сталася, калі дабраслаўляў іх, стаў аддаляцца ад іх і быў узьнесены ў неба.
52 І яны, пакланіўшыся Яму, вярнуліся ў Ерусалім з вялікай радасьцю,
53 і былі ўсьцяж у сьвятыні, хвалячы і дабраслаўляючы Бога. Амэн.

ЭВАНГЕЛЬЛЕ ПАВОДЛЕ ЯНА

1 На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова.
2 Яно было ў Бога на пачатку.
3 Усё праз Яго сталася, і без Яго нічога не было з таго, што сталася.
4 У Ім жыцьцё было, і жыцьцё было сьвятлом для людзей.
5 І сьвятло ў цемры сьвеціць, і цемра не агарнула яго.
6 Быў чалавек, пасланы ад Бога; імя яго Ян.
7 Ён прыйшоў дзеля сьведчаньня, каб сьведчыў пра Сьвятло, каб усе мелі веру праз яго.
8 Ня быў ён сьвятлом, але [прыйшоў,] каб сьведчыць пра Сьвятло.
9 Было Сьвятло праўдзівае, якое прасьвятляе ўсякага чалавека, што прыходзіць у сьвет.
10 Было Яно ў сьвеце, і сьвет праз Яго стаўся, і сьвет Яго не пазнаў.
11 Да сваіх прыйшло, і свае Яго не прынялі.
12 А тым, што прынялі Яго, дало Яно ім уладу дзецьмі Божымі стацца, тым, якія вераць у імя Яго,
13 тым, што не ад крыві, не ад жаданьня цела, не ад жаданьня мужа, але ад Бога нарадзіліся.
14 І Слова Целам сталася, і пасялілася між нас, поўнае ласкі і праўды, і мы бачылі славу Яго, славу, як Адзінароднага ў Айца.
15 Ян сьведчыць пра Яго і ўсклікае, кажучы: «Гэта Той, пра Якога я сказаў: “Той, Які пасьля мяне ідзе, наперадзе мяне стаў, бо раней за мяне быў”».
16 І ад поўнасьці Яго ўсе мы прынялі ласку [Божую] за ласкай [Божай].
17 Бо Закон быў дадзены праз Майсея, а ласка [Божая] і праўда сталіся праз Ісуса Хрыста.
18 Бога ня бачыў ніхто ніколі; Адзінародны Сын, Які ва ўлоньні Айца, Той зьявіў.
19 І вось сьведчаньне Яна, калі Юдэі з Ерусаліму паслалі сьвятароў і лявітаў, каб спыталіся ў яго: «Хто ты?»
20 І ён вызнаў, і ня выракся, і вызнаў: «Я — не Хрыстос».
21 І спыталіся ў яго: «Дык што? Ты — Ільля?» І гаворыць: «Не». «Прарок?» І адказаў: «Не».
22 Дык сказалі яму: «Хто ж ты? Каб нам даць адказ тым, якія нас паслалі, што ты кажаш пра самога сябе?»
23 Ён сказаў: «Я — голас таго, хто кліча ў пустыні: “Прастуйце шлях Госпаду”, як сказаў прарок Ісая».
24 А пасланыя былі з фарысэяў.
25 І яны спыталіся ў яго, і сказалі яму: «Дык чаму ты хрысьціш, калі ты не Хрыстос, ані Ільля, ані прарок?»
26 Адказаў ім Ян, кажучы: «Я хрышчу вадой, але паўстаў сярод вас Той, Якога вы ня ведаеце;
27 гэта Той, Які ідзе за мною, але наперадзе мяне быў, Якому я ня варты разьвязаць рамень сандала Ягонага».
28 Сталася гэта ў Бэтабары, за Ярданам, дзе хрысьціў Ян.
29 На наступны дзень бачыць Ян Ісуса, Які ішоў да яго, і кажа: «Вось Ягня Божае, Які бярэ на Сябе грэх сьвету.
30 Гэта Той, пра Якога я сказаў: “Ідзе за мною Муж, Які наперадзе мяне стаў, бо раней за мяне быў”.
31 І я ня ведаў Яго; але дзеля таго, каб Ён быў зьяўлены Ізраілю, прыйшоў я, хрысьцячы вадою».
32 І засьведчыў Ян, кажучы: «Я бачыў Духа, Які зыходзіў з неба як голуб і застаўся на Ім.
33 І я ня ведаў Яго, але Той, Які паслаў мяне хрысьціць вадою, сказаў мне: “На Кім угледзіш Духа, Які зыходзіць і застаецца на Ім, Ён і ёсьць Той, Які хрысьціць Духам Сьвятым”.
34 І я ўбачыў і засьведчыў, што Ён і ёсьць Сын Божы».
35 На наступны дзень ізноў стаяў Ян і двое з вучняў ягоных.
36 І, угледзеўшы, што ідзе Ісус, ён гаворыць: «Вось, Ягня Божае!»

37 І пачулі двое вучняў ягоных, як казаў гэта, і пайшлі за Ісусам.
38 Ісус жа, павярнуўшыся і ўбачыўшы, што яны ідуць за Ім, кажа ім: «Што шукаеце?» Яны ж
сказалі Яму: «Раббі, — што перакладаецца Настаўнік, — дзе жывеш?»
39 Гаворыць ім: «Прыйдзіце і ўбачыце». Яны пайшлі і ўбачылі, дзе Ён жыве, і засталіся ў Яго
той дзень. Было ж каля дзясятае гадзіны.
40 Адзін з двух, якія пачулі ад Яна і пайшлі за Ім, быў Андрэй, брат Сымона Пятра.
41 Ён першы знаходзіць брата свайго Сымона і кажа яму: «Мы знайшлі Мэсію, — што
перакладаецца Хрыстос».
42 І ён прывёў яго да Ісуса. Ісус жа, глянуўшы на яго, сказаў: «Ты — Сымон, сын Ёны, ты будзеш
называцца Кіфа, — што перакладаецца Скала».
43 На наступны дзень Ісус хацеў ісьці ў Галілею, і знаходзіць Філіпа, і кажа яму: «Ідзі за Мною».
44 Філіп жа быў з Бэтсаіды, з гораду Андрэя і Пятра.
45 Філіп знаходзіць Натанаэля і кажа яму: «Мы знайшлі Таго, пра Каго пісаў Майсей у Законе
і Прарокі, — Ісуса, сына Язэпа, што з Назарэту».
46 І сказаў яму Натанаэль: «Ці ж можа быць што добрае з Назарэту?» Гаворыць яму Філіп:
«Прыйдзі і паглядзі».
47 Ісус убачыў Натанаэля, які ішоў да Яго, і кажа пра яго: «Вось, сапраўды, Ізраільцянін, у якім
няма подступу».
48 Натанаэль кажа Яму: «Адкуль Ты даведаўся пра мяне?» Адказаў Ісус і сказаў яму: «Раней,
чым Філіп паклікаў цябе, калі ты быў пад дрэвам фігавым, Я бачыў цябе».
49 Адказаў Яму Натанаэль: «Раббі! Ты — Сын Божы! Ты — Валадар Ізраіля!»
50 Адказаў Ісус і сказаў яму: «Ты верыш, бо Я сказаў табе: “Я бачыў цябе пад дрэвам фігавым”?
Угледзіш больш за гэтае».
51 І кажа яму: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: ад цяпер угледзіце неба адчыненае і анёлаў
Божых, якія ўзыходзяць і зыходзяць да Сына Чалавечага».

Ян 2

1 На трэці дзень было вясельле ў Кане Галілейскай, і маці Ісуса была там.
2 Быў таксама запрошаны і Ісус, і вучні Ягоныя на вясельле.
3 І, як не хапіла віна, маці Ісуса кажа Яму: «Віна ня маюць».
4 Кажа ёй Ісус: «Што Мне і табе, жанчына? Гадзіна Мая яшчэ не прыйшла».
5 Гаворыць маці Ягоная слугам: «Што Ён вам скажа, зрабіце».
6 Было ж там шэсьць каменных глякоў, якія стаялі дзеля ачышчэньня юдэйскага і зьмяшчалі
дзьве ці тры меры.
7 Кажа ім Ісус: «Напоўніце вадою глякі». І напоўнілі іх да верху.
8 І кажа ім: «Чэрпайце цяпер і нясіце да маршалка». І занесьлі.
9 Калі ж маршалак пакаштаваў вады, якая сталася віном, — а ён ня ведаў, адкуль яно, слугі ж,
якія налівалі ваду, ведалі, — кліча жаніха
10 і кажа яму: «Кожны чалавек перш падае добрае віно, а як нап’юцца, тады горшае; ты ж
добрае віно захаваў дагэтуль».
11 Так зрабіў Ісус у Кане Галілейскай пачатак знакам і выявіў славу Сваю, і паверылі ў Яго вучні
Ягоныя.
12 Пасьля гэтага прыйшоў Ён у Капэрнаум, Сам і маці Ягоная, і браты Ягоныя, і вучні Ягоныя,
і заставаліся там некалькі дзён.
13 І была блізка Пасха юдэйская, і ўзыйшоў Ісус у Ерусалім.
14 І знайшоў у сьвятыні тых, што прадавалі валоў, авечак і галубоў, і мяняльнікаў, якія там
сядзелі.
15 І, зрабіўшы біч з вяровак, Ён выгнаў са сьвятыні ўсіх, а таксама авечак і валоў, і грошы
мяняльнікам рассыпаў, і сталы іхнія перавярнуў;
16 і сказаў тым, што прадавалі галубоў: «Забярыце гэта адсюль і не рабіце дом Айца Майго
домам гандлю».
17 І ўзгадалі вучні Ягоныя, што напісана: «Руплівасьць пра дом Твой зьядае Мяне».

18 Адказалі тады Юдэі і сказалі Яму: «Які знак пакажаш нам, што гэтак робіш?»
19 Адказаў Ісус і сказаў ім: «Зруйнуйце гэтую бажніцу, і Я ў тры дні адбудую яе».
20 Сказалі тады Юдэі: «Сорак шэсьць гадоў будавалася бажніца гэтая, а Ты ў тры дні адбудуеш яе?»
21 А Ён гаварыў пра бажніцу цела Свайго.
22 Калі ж Ён уваскрос з мёртвых, узгадалі вучні Ягоныя, што Ён казаў гэтае, і паверылі Пісаньню і словам, якія сказаў Ісус.
23 Калі ж Ён быў у Ерусаліме на Пасху ў сьвяты, многія паверылі ў імя Яго, бачачы знакі, якія Ён чыніў.
24 Але Сам Ісус не даверыўся ім, бо ведаў усіх
25 і ня меў патрэбы, каб хто сьведчыў пра чалавека, бо Ён ведаў, што было ў чалавеку.

Ян 3

1 Быў жа сярод фарысэяў чалавек на імя Нікадэм, начальнік юдэйскі.
2 Ён прыйшоў да Ісуса ўначы і сказаў Яму: «Раббі! Мы ведаем, што Ты Настаўнік, Які прыйшоў ад Бога, бо ніхто ня можа рабіць такіх знакаў, якія Ты робіш, калі б ня быў з ім Бог».
3 Адказаў яму Ісус і сказаў: «Сапраўды, сапраўды кажу табе: Калі хто не народзіцца звыш, ня можа ўбачыць Валадарства Божага».
4 Кажа Яму Нікадэм: «Як можа чалавек нарадзіцца, калі ён стары? Няўжо ж ён другі раз можа ўвайсьці ў чэрава маці сваёй і нарадзіцца?»
5 Адказаў Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу табе: Калі хто не народзіцца з вады і Духа, ня можа ўвайсьці ў Валадарства Божае.
6 Народжанае з цела ёсьць цела, а народжанае з Духа ёсьць дух.
7 Не зьдзіўляйся, што Я сказаў табе: Трэба вам нарадзіцца звыш.
8 Дух дыхае, дзе хоча, і голас Яго чуеш, але ня ведаеш, адкуль прыходзіць і куды адыходзіць; гэтак і ўсякі, народжаны з Духа».
9 Адказаў Нікадэм і сказаў Яму: «Як гэта можа стацца?»
10 Адказаў Ісус і сказаў яму: «Ты — настаўнік Ізраіля, і гэтага ня ведаеш?
11 Сапраўды, сапраўды кажу табе: Мы гаворым пра тое, што ведаем, і сьведчым пра тое, што бачылі, і вы сьведчаньня Нашага не прыймаеце.
12 Калі Я сказаў вам пра зямное, і ня верыце, як паверыце, калі буду гаварыць пра нябеснае?
13 І ніхто не ўзыйшоў у неба, толькі Сын Чалавечы, Які ў небе, Які з неба зыйшоў.
14 І, як Майсей падняў зьмея ў пустыні, так мусіць быць падняты Сын Чалавечы,
15 каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае.
16 Бо так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго Адзінароднага аддаў, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае.
17 Бо не паслаў Бог Сына Свайго ў сьвет, каб судзіць сьвет, але каб сьвет быў збаўлены праз Яго.
18 Хто верыць у Яго, ня судзіцца, а хто ня верыць, той ужо асуджаны, бо не паверыў у імя Адзінароднага Сына Божага.
19 Суд жа такі, што Сьвятло прыйшло ў сьвет, але людзі палюбілі цемру больш за сьвятло, бо ўчынкі іх былі злыя.
20 Бо кожны, хто робіць благое, ненавідзіць сьвятло і не ідзе да сьвятла, каб не былі дакараныя ўчынкі ягоныя.
21 А хто чыніць праўду, ідзе да сьвятла, каб відочнымі былі ўчынкі ягоныя, бо яны ў Богу ўчынены».
22 Пасьля гэтага прыйшоў Ісус і вучні Ягоныя ў зямлю Юдэйскую, і там быў з імі, і хрысьціў.
23 Ян жа таксама хрысьціў у Эноне, недалёка ад Салему, бо вады там было шмат, і прыходзілі туды, і хрысьціліся,
24 бо Ян яшчэ ня быў кінуты ў вязьніцу.
25 І сталася спрэчка ў Янавых вучняў з Юдэямі пра ачышчэньне.

26 І прыйшлі да Яна, і сказалі яму: «Раббі! Той, Які быў з табою за Ярданам, пра Якога ты
сьведчыў, вось, Ён хрысьціць, і ўсе ідуць да Яго».
27 Адказаў Ян і сказаў: «Ня можа чалавек нічога ўзяць, калі яму ня будзе дадзена з неба.
28 Самі вы сьведкі мне ў тым, што я сказаў: “Я не Хрыстос, але я пасланы перад Ім”.
29 Хто мае нявесту, той жаніх, а сябра жаніха, які стаіць і слухае яго, радасьцю радуецца дзеля
голасу жаніха. Вось гэтая радасьць мая споўнілася.
30 Яму трэба расьці, а мне — малець».
31 Хто з вышыні прыходзіць, Той вышэй за ўсіх, а хто з зямлі, той зямны і з зямлі гаворыць.
Хто з неба прыходзіць, Той вышэй за ўсіх,
32 і што бачыў і чуў, пра тое сьведчыць, і ніхто не прыймае сьведчаньня Ягонага.
33 Хто ж прыняў Яго сьведчаньне, той запячатаў, што Бог праўдзівы.
34 Бо Той, Каго паслаў Бог, гаворыць словы Божыя, бо ня мераючы дае Бог Духа.
35 Айцец любіць Сына і ўсё аддаў у руку Яго.
36 Хто верыць у Сына, мае жыцьцё вечнае, а хто ў Сына ня верыць, ня ўгледзіць жыцьця, але
гнеў Божы будзе на ім.

Ян 4

1 Калі ж даведаўся Госпад, што пачулі фарысэі, што Ісус больш вучняў здабывае і хрысьціць,
чым Ян, —
2 хоць Сам Ісус не хрысьціў, але вучні Ягоныя, —
3 Ён пакінуў Юдэю і пайшоў зноў у Галілею.
4 Мусіў жа Ён праходзіць праз Самарыю.
5 І вось, прыходзіць Ён у горад Самаранскі, называны Сыхар, недалёка поля, якое даў Якуб
Язэпу, сыну свайму.
6 Была ж там крыніца Якуба. Дык Ісус, стомлены падарожжам, сеў ля крыніцы. Было каля
шостае гадзіны.
7 Прыходзіць жанчына з Самарыі начэрпаць вады. Гаворыць ёй Ісус: «Дай Мне піць».
8 Бо вучні Ягоныя адыйшлі ў горад набыць ежы.
9 Жанчына Самаранка кажа Яму: «Як Ты, Юдэй, просіш піць у мяне, жанчыны Самаранкі?» Бо
Юдэі ня маюць зносін з Самаранамі.
10 Адказаў Ісус і сказаў ёй: «Калі б ты ведала дар Божы і Хто кажа табе: “Дай Мне піць”, то ты
прасіла б у Яго, і Ён даў бы табе вады жывое».
11 Гаворыць Яму жанчына: «Пане! У Цябе і зачарпнуць няма чым, а калодзеж глыбокі. Дык
адкуль у Цябе вада жывая?
12 Няўжо Ты большы за бацьку нашага Якуба, які даў нам гэты калодзеж і сам з яго піў, і сыны
ягоныя, і статак ягоны?»
13 Адказаў Ісус і сказаў ёй: «Усякі, хто п’е гэтую ваду, зноў будзе смагнуць.
14 Хто ж вып’е ваду, якую Я яму дам, ня будзе смагнуць ніколі, але вада, якую Я дам яму,
станецца ў ім крыніцаю вады, якая цячэ ў жыцьцё вечнае».
15 Гаворыць Яму жанчына: «Пане! Дай мне гэтай вады, каб я ня смагнула і не прыходзіла сюды
чэрпаць».
16 Гаворыць ёй Ісус: «Ідзі, пакліч мужа твайго і прыходзь сюды».
17 Адказала жанчына і сказала: «Я ня маю мужа». Гаворыць ёй Ісус: «Добра ты сказала, што
ня маеш мужа,
18 бо мела ты пяць мужоў, і той, якога цяпер маеш, ня муж табе. Гэта ты праўдзіва сказала».
19 Гаворыць Яму жанчына: «Пане! Бачу, што Ты — прарок.
20 Бацькі нашыя пакланяліся на гэтай гары, а вы кажаце, што ў Ерусаліме месца, дзе павінны
пакланяцца».
21 Гаворыць ёй Ісус: «Жанчына, павер Мне, што прыходзіць час, калі ані на гэтай гары, ані ў
Ерусаліме ня будзеце пакланяцца Айцу.

22 Вы ня ведаеце, каму пакланяецеся; а мы ведаем, Каму пакланяемся, бо збаўленьне ад
Юдэяў.
23 Але прыходзіць час, і ён ужо прыйшоў, калі сапраўдныя паклоньнікі будуць пакланяцца
Айцу ў духу і праўдзе, бо гэткіх паклоньнікаў Айцец шукае Сабе.
24 Бог ёсьць Дух, і тыя, якія пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і праўдзе».
25 Гаворыць Яму жанчына: «Ведаю, што прыходзіць Мэсія, называны Хрыстос, і калі Ён
прыйдзе, абвесьціць нам усё».
26 Гаворыць ёй Ісус: «Гэта Я, Які гавару з табою».
27 У гэты час прыйшлі вучні Ягоныя і зьдзівіліся, што Ён гаварыў з жанчынаю, але ніводзін не
сказаў: «Што шукаеш?» ці: «Што гаворыш з ёю?»
28 Тады жанчына пакінула гляк свой, і адыйшла ў горад, і гаворыць людзям:
29 «Пайдзіце, пабачце Чалавека, Які сказаў мне ўсё, што я зрабіла. Ці не Хрыстос гэта?»
30 Яны выйшлі з гораду і пайшлі да Яго.
31 Тым часам вучні прасілі Яго, кажучы: «Раббі! Еш».
32 Ён жа сказаў ім: «Я маю ежу, якой вы ня ведаеце».
33 Тады вучні гаварылі паміж сабою: «Няўжо нехта прынёс Яму есьці?»
34 Гаворыць ім Ісус: «Мая ежа ў тым, каб выканаць волю Таго, Хто Мяне паслаў, і скончыць
справу Яго.
35 Ці ня кажаце вы, што яшчэ чатыры месяцы, і прыйдзе жніво? Вось, Я кажу вам: Падыміце
вочы вашыя і паглядзіце на нівы, як яны пабялелі да жніва.
36 Хто жне, атрымлівае плату і зьбірае плён дзеля жыцьця вечнага, каб і сейбіт, і жнец разам
радаваліся.
37 Бо ў гэтым спраўджваецца слова: “Адзін сее, а другі жне”.
38 Я паслаў вас жаць тое, над чым вы не працавалі; іншыя працавалі, а вы прыйшлі на працу
іхнюю».
39 І шмат Самаранаў з гораду таго паверылі ў Яго праз слова жанчыны, якая сьведчыла: «Ён
сказаў мне ўсё, што я зрабіла».
40 І вось, калі прыйшлі да Яго Самаране, то прасілі Яго застацца ў іх, і Ён застаўся там два дні.
41 І яшчэ больш паверыла праз слова Яго.
42 А жанчыне гэтай казалі: «Ужо ня дзеля твайго аповеду верым, бо мы самі чулі і даведаліся,
што гэта праўдзіва Збаўца сьвету, Хрыстос».
43 Праз два дні выйшаў Ён адтуль і пайшоў у Галілею.
44 Бо Сам Ісус сьведчыў, што прарок ня мае пашаны ў сваёй бацькаўшчыне.
45 Калі ж прыйшоў Ён у Галілею, Галілейцы прынялі Яго, бо бачылі ўсё, што зрабіў у Ерусаліме
ў часе сьвята; бо і самі яны хадзілі на сьвята.
46 І вось Ісус ізноў прыйшоў у Кану Галілейскую, дзе зрабіў з вады віно. І быў у Капэрнауме
нейкі ўрадовец, у якога занядужаў сын.
47 Ён, пачуўшы, што Ісус прыйшоў з Юдэі ў Галілею, прыйшоў да Яго і прасіў Яго прыйсьці і
аздаравіць сына ягонага, бо той канаў.
48 І сказаў яму Ісус: «Вы не паверыце, калі ня ўбачыце знакаў і цудаў».
49 Урадовец кажа Яму: «Госпадзе! Прыйдзі, пакуль не памёр хлопчык мой».
50 Кажа яму Ісус: «Ідзі, сын твой жывы!» І паверыў чалавек той словам, якія сказаў яму Ісус, і
пайшоў.
51 І калі ён ужо вяртаўся дадому, перанялі яго слугі ягоныя і паведамілі, кажучы: «Сын твой
жывы».
52 Ён спытаўся ў іх: «А якой гадзіне палягчэла яму?» І сказалі яму: «Учора а сёмай гадзіне
гарачка пакінула яго».
53 Дык даведаўся бацька, што гэта была тая гадзіна, калі Ісус сказаў яму: «Сын твой жывы». І
паверыў ён сам і ўвесь дом ягоны.
54 Гэта ўжо другі знак учыніў Ісус, вярнуўшыся з Юдэі ў Галілею.

Ян 5

1 Пасьля гэтага было сьвята юдэйскае, і ўзыйшоў Ісус у Ерусалім.
2 Ёсьць жа ў Ерусаліме каля Авечае брамы сажалка, якая завецца па-гебрайску Бэтэзда і якая
мае пяць прысенкаў.
3 У іх ляжала вялікае мноства нядужых, сьляпых, кульгавых, ссохшых, якія чакалі руху вады;
4 бо анёл Госпадаў у пэўны час зыходзіў у сажалку і каламуціў ваду; і хто першы ўваходзіў у
яе пасьля ўскаламучаньня вады, той ставаўся здаровым, на што б ні хварэў.
5 І быў тут нейкі чалавек, які меў нядужасьць трыццаць восем гадоў.
6 Ісус убачыў яго, што ён ляжаў, і, даведаўшыся, што ён ляжыць ужо доўгі час, кажа яму: «Ці
хочаш стацца здаровым?»
7 Нядужы адказаў Яму: «Пане, я ня маю чалавека, які спусьціў бы мяне ў сажалку, калі
ўскаламуціцца вада; калі ж сам прыходжу, другі ўжо зыходзіць раней за мяне».
8 Кажа яму Ісус: «Устань, вазьмі ложак твой і хадзі».
9 І адразу стаўся здаровым той чалавек, і ўзяў ложак свой, і пайшоў. Была ж субота ў той дзень.
10 Дзеля гэтага Юдэі казалі аздароўленаму: «Сёньня субота, ня можна табе браць ложак».
11 Ён адказаў ім: «Той, Які мяне зрабіў здаровым, Ён мне сказаў: “Вазьмі ложак твой і хадзі”».
12 Тады спыталіся ў яго: «Хто Той Чалавек, Які сказаў табе: “Вазьмі ложак твой і хадзі?”»
13 Аздароўлены ж ня ведаў, хто Ён, бо Ісус зьнік у натоўпе, які быў у тым месцы.
14 Пасьля гэтага Ісус знаходзіць яго ў сьвятыні і кажа яму: «Вось, ты стаўся здаровым, не грашы
больш, каб ня сталася з табою нешта горшае».
15 Чалавек гэты пайшоў і абвясьціў Юдэям, што гэта Ісус аздаравіў яго.
16 І дзеля гэтага пачалі Юдэі перасьледаваць Ісуса, і шукалі, каб забіць Яго, бо Ён учыніў гэткае
ў суботу.
17 Ісус жа адказваў ім: «Айцец Мой дагэтуль робіць, і Я раблю».
18 Дзеля гэтага Юдэі яшчэ больш шукалі, каб забіць Яго, бо Ён ня толькі парушаў суботу, але і
Айцом Сваім называў Бога, робячы Сябе роўным Богу.
19 Тады адказваў Ісус і сказаў ім: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: Сын нічога ня можа рабіць
Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць, бо што Ён робіць, тое і Сын робіць таксама.
20 Бо Айцец любіць Сына і паказвае Яму ўсё, што Сам робіць, і большыя за гэтыя пакажа Яму
справы, ажно вы зьдзівіцеся.
21 Бо як Айцец уваскрашае мёртвых і ажыўляе, так і Сын ажыўляе, каго хоча.
22 Бо Айцец і ня судзіць нікога, але ўвесь суд аддаў Сыну,
23 каб усе шанавалі Сына, як шануюць Айца. Хто не шануе Сына, не шануе і Айца, Які паслаў
Яго.
24 Сапраўды, сапраўды кажу вам: Хто слухае слова Маё і верыць у Таго, Хто паслаў Мяне, мае
жыцьцё вечнае і на суд не ідзе, але перайшоў ад сьмерці ў жыцьцё.
25 Сапраўды, сапраўды кажу вам: Прыходзіць гадзіна, і яна ўжо прыйшла, калі мёртвыя
пачуюць голас Сына Божага і, пачуўшы, ажывуць.
26 Бо як Айцец мае жыцьцё ў Сабе, так і Сыну даў жыцьцё мець у Сабе.
27 І даў Яму ўладу чыніць суд, бо Ён ёсьць Сын Чалавечы.
28 Не зьдзіўляйцеся гэтаму: бо прыходзіць гадзіна, калі ўсе, што ў магілах, пачуюць голас
Ягоны,
29 і выйдуць тыя, што чынілі добрае, на ўваскрашэньне жыцьця, а тыя, што чынілі благое, —
на ўваскрашэньне суду.
30 Я нічога не магу рабіць Сам ад Сябе. Як чую, так і суджу, і суд Мой праведны, бо Я не шукаю
Маёй волі, але волі Айца, Які паслаў Мяне.
31 Калі Я сьведчу Сам пра Сябе, сьведчаньне Маё ня ёсьць праўдзівае.
32 Ёсьць Другі, Які сьведчыць пра Мяне, і Я ведаю, што праўдзівае тое сьведчаньне, якім Ён
сьведчыць пра Мяне.
33 Вы пасылалі да Яна, і ён засьведчыў пра праўду.
34 Але Я не ад чалавека прыймаю сьведчаньне, але кажу гэта, каб вы былі збаўленыя.

35 Ён быў сьвечкай, якая гарэла і сьвяціла, а вы хацелі часіну радавацца пры сьвятле ягоным.
36 Я ж маю сьведчаньне, большае за Янава, бо справы, якія Айцец даў Мне скончыць, самыя
гэтыя справы, якія Я раблю, сьведчаць пра Мяне, бо Айцец паслаў Мяне.
37 І Айцец, Які паслаў Мяне, Сам засьведчыў пра Мяне. Але вы ані голасу Яго ніколі ня чулі, ані
аблічча Яго ня бачылі,
38 і ня маеце слова Ягонага, якое ў вас было б, бо ня верыце Таму, Каго Ён паслаў.
39 Дасьледуйце Пісаньні, бо вы думаеце праз іх мець жыцьцё вечнае, і яны сьведчаць пра Мяне.
40 Але вы ня хочаце прыйсьці да Мяне, каб мець жыцьцё.
41 Славы ад людзей не прыймаю,
42 але ведаю вас, што любові да Бога ня маеце ў сабе.
43 Я прыйшоў у імя Айца Майго, і вы не прыймаеце Мяне, а калі другі прыйдзе ў сваё імя, таго
прыймеце.
44 Як вы можаце верыць, калі прыймаеце славу адзін ад аднаго, а славы, якая ад адзінага Бога,
не шукаеце.
45 Ня думайце, што Я буду вінаваціць вас перад Айцом; ёсьць на вас абвінавальнік Майсей, на
якога вы спадзеяцёся.
46 Бо, калі б вы верылі Майсею, то верылі б і Мне, бо ён пісаў пра Мяне.
47 Калі ж ягоным пісаньням ня верыце, як Маім словам паверыце?»

Ян 6

1 Пасьля гэтага адыйшоў Ісус на другі бок мора Галілейскага, значыцца, Тыбэрыядзкага.
2 І ішоў за Ім шматлікі натоўп, бо бачылі знакі, якія Ён учыняў адносна нядужых.
3 І ўзыйшоў Ісус на гару, і там сядзеў з вучнямі Сваімі.
4 А была блізка Пасха, сьвята юдэйскае.
5 Тады Ісус, падняўшы вочы і ўгледзеўшы, што вялікі натоўп ідзе да Яго, кажа Філіпу: «Дзе мы
купім хлеба, каб яны пад'елі?»
6 Казаў жа Ён гэта, выпрабоўваючы яго, бо Сам ведаў, што меўся зрабіць.
7 Адказаў Яму Філіп: «Ім на дзьвесьце дынараў ня хопіць хлеба, каб кожны з іх атрымаў хоць
нешта».
8 Кажа Яму адзін з вучняў Ягоных, Андрэй, брат Сымона Пятра:
9 «Тут ёсьць адзін хлопчык, які мае пяць хлябоў ячменных і дзьве рыбы; але што гэта для
такога мноства?»
10 Ісус сказаў: «Скажыце людзям узьлегчы». Было ж на тым месцы шмат травы. Тады ўзьлеглі
мужчыны лікам каля пяці тысячаў.
11 І ўзяў Ісус хлябы, і, падзякаваўшы, раздаў вучням, а вучні — тым, якія ўзьляглі, падобным
чынам і рыбы, колькі хто хацеў.
12 Калі ж яны насыціліся, Ён кажа вучням Сваім: «Зьбярыце кавалкі, якія засталіся, каб нічога
не прапала».
13 Тады сабралі і напоўнілі дванаццаць кашоў кавалкамі ад пяці ячменных хлябоў, што
засталіся ў тых, якія елі.
14 Людзі ж, убачыўшы знак, які ўчыніў Ісус, казалі: «Гэта сапраўды Прарок, Які прыходзіць у
сьвет».
15 Ісус жа, даведаўшыся, што яны маюць прыйсьці і ўзяць Яго, каб зрабіць Яго валадаром, ізноў
адыйшоў на гару адзін.
16 Калі надыйшоў вечар, вучні Ягоныя зыйшлі да мора
17 і, увайшоўшы ў човен, паплылі на другі бок мора ў Капэрнаум. І было ўжо цёмна, і Ісус не
прыйшоў да іх.
18 А мора хвалявалася, бо дзьмуў моцны вецер.
19 Праплыўшы каля дваццаці ці трыццаці стадыяў, яны бачаць Ісуса, Які ідзе па моры і ўжо
недалёка ад чаўна, і спалохаліся.
20 Ён жа кажа ім: «Гэта Я, ня бойцеся!»
21 Яны хацелі ўзяць Яго ў човен, і адразу човен прыстаў да берагу, да якога плылі.

22 На заўтра натоўп, які стаяў на другім баку мора, убачыў, што там не было другога чаўна,
апрача аднаго, у які ўвайшлі вучні Ягоныя, і што Ісус не ўваходзіў у човен з вучнямі Сваімі,
але адплылі адны вучні Ягоныя.
23 Другія ж чаўны прыплылі з Тыбэрыяды, паблізу ад таго месца, дзе елі хлеб, за які дзякаваў
Госпад.
24 Калі натоўп убачыў, што там няма ані Ісуса, ані вучняў Ягоных, дык увайшлі ў чаўны і
прыплылі ў Капэрнаум, шукаючы Ісуса.
25 І, знайшоўшы Яго на другім баку мора, сказалі Яму: «Раббі, калі Ты сюды прыйшоў?»
26 Адказаў ім Ісус і сказаў: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: вы шукаеце Мяне не таму, што
бачылі знак, але таму, што елі хлеб і наеліся.
27 Працуйце ж ня дзеля ежы, што зьнішчаецца, але дзеля ежы, якая застаецца ў жыцьцё вечнае,
якое дасьць вам Сын Чалавечы, бо на Ім паставіў пячатку Айцец Бог».
28 Тады сказалі Яму: «Што нам рабіць, каб рабіць справы Божыя?»
29 Адказаў Ісус і сказаў ім: «Гэта ёсьць справа Божая, каб вы верылі ў Таго, Каго Ён паслаў».
30 Тады яны сказалі Яму: «Які тады зробіш знак, каб мы ўбачылі і паверылі Табе? Што ўчыніш?
31 Бацькі нашыя елі манну ў пустыні, як напісана: “Хлеб з неба даў ім есьці”».
32 Сказаў тады ім Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: не Майсей даў вам хлеб з неба, але
Айцец Мой дае вам праўдзівы хлеб з неба,
33 бо хлеб Божы ёсьць Той, Які зыходзіць з неба і дае жыцьцё сьвету».
34 Тады сказалі Яму: «Госпадзе! Давай нам заўсёды такі хлеб».
35 Ісус жа сказаў ім: «Я ёсьць хлеб жыцьця. Хто прыходзіць да Мяне, ня будзе галодны, і хто
верыць у Мяне, ня будзе смагнуць ніколі.
36 Але Я сказаў вам, што вы бачылі Мяне, і ня верыце.
37 Усё, што дае Мне Айцец, да Мяне прыйдзе, і таго, хто прыходзіць да Мяне, ня выганю прэч.
38 Бо Я зыйшоў з неба не дзеля таго, каб чыніць Маю волю, але волю Таго, Хто паслаў Мяне.
39 А гэта ёсьць воля Айца, Які паслаў Мяне, каб з таго, што Ён Мне даў, нічога не загубіць, але
ўваскрасіць усё ў апошні дзень.
40 Гэта ж ёсьць воля Таго, Хто паслаў Мяне, каб кожны, хто бачыць Сына і верыць у Яго, меў
жыцьцё вечнае, і Я ўваскрашу Яго ў апошні дзень».
41 Тады Юдэі пачалі наракаць на Яго, бо Ён сказаў: «Я ёсьць хлеб, які з неба зыйшоў»,
42 і гаварылі: «Ці ж Ён не Ісус, сын Язэпаў, бацьку і маці Якога мы ведаем? Як жа Ён кажа: “Я
зыйшоў з неба”?»
43 Тады адказаў Ісус і сказаў ім: «Не наракайце між сабою.
44 Ніхто ня можа прыйсьці да Мяне, калі Айцец, Які паслаў Мяне, не прыцягне яго, і Я
ўваскрашу яго ў апошні дзень.
45 Напісана ў Прарокаў: “І будуць усе навучаны Богам”. Дык кожны, хто пачуў ад Айца і
навучыўся, прыходзіць да Мяне.
46 Не таму, што нехта бачыў Айца, акрамя Таго, Які ў Бога, Ён бачыў Айца.
47 Сапраўды, сапраўды кажу вам: хто верыць у Мяне, мае жыцьцё вечнае.
48 Я — хлеб жыцьця.
49 Бацькі вашыя елі манну ў пустыні і паўміралі.
50 Хлеб жа, які з неба зыходзіць, такі, што той, хто будзе есьці яго, не памрэ.
51 Я — хлеб жывы, які з неба зыйшоў. Хто будзе есьці хлеб гэты, жыць будзе на вякі. Хлеб жа,
які Я дам, ёсьць Цела Маё, якое Я аддам за жыцьцё сьвету».
52 І спрачаліся між сабою Юдэі, кажучы: «Як Ён можа даць нам есьці Цела Сваё?»
53 Тады сказаў ім Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: калі ня будзеце есьці Цела Сына
Чалавечага і піць Кроў Ягоную, ня будзеце мець жыцьця ў сабе.
54 Хто есьць Цела Маё і п’е Кроў Маю, мае жыцьцё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень.
55 Бо Цела Маё сапраўды ёсьць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсьць пітво.
56 Хто есьць Цела Маё і п’е Кроў Маю, у-ва Мне ёсьць, і Я ў ім.

57 Як паслаў Мяне жывы Айцец, і Я жыву праз Айца, так і той, хто есьць Мяне, жыць будзе праз
Мяне.
58 Гэта і ёсьць хлеб, які з неба зыйшоў. Ня так, як бацькі вашыя елі манну і паўміралі. Хто есьць
гэты хлеб, жыць будзе на вякі».
59 Гэта гаварыў Ён у сынагозе, навучаючы ў Капэрнауме.
60 Многія з вучняў Ягоных, якія чулі гэта, казалі: «Жорсткае гэта слова. Хто можа слухаць
яго?»
61 Ісус жа, ведаючы ў Сабе, што вучні Ягоныя наракаюць адносна гэтага, сказаў ім: «Ці гэта вас
згаршае?
62 А калі ўбачыце Сына Чалавечага, Які ўзыходзіць туды, дзе быў раней?
63 Дух ажыўляе, а цела не прыносіць аніякай карысьці. Словы, якія Я вам кажу, ёсьць дух і
жыцьцё.
64 Але ёсьць некаторыя сярод вас, якія ня вераць». Бо Ісус ад пачатку ведаў, што ёсьць тыя,
якія ня вераць, і хто выдасьць Яго.
65 І сказаў: «Дзеля гэтага і сказаў Я вам, што ніхто ня можа прыйсьці да Мяне, калі яму ня
будзе дадзена Айцом Маім».
66 З таго часу многія з вучняў Ягоных пайшлі назад і ўжо не хадзілі з Ім.
67 Тады Ісус сказаў Дванаццаці: «Ці ня хочаце і вы зыйсьці?»
68 Адказаў тады Яму Сымон Пётар: «Госпадзе! Да каго нам ісьці? Ты маеш словы жыцьця
вечнага.
69 І мы паверылі, і пазналі, што Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога».
70 Адказаў ім Ісус: «Ці ня вас дванаццаць Я выбраў? Але адзін з вас — д'ябал».
71 Гаварыў жа Ён пра Юду Сымонавага Іскарыёта, бо той меўся выдаць Яго, хоць быў адзін з
Дванаццаці.

Ян 7

1 І хадзіў Ісус пасьля гэтага па Галілеі, бо не хацеў хадзіць па Юдэі, таму што Юдэі шукалі забіць
Яго.
2 Было ж блізка сьвята юдэйскае, [сьвята] Намётаў.
3 Тады браты Ягоныя сказалі Яму: «Выйдзі адсюль і пайдзі ў Юдэю, каб і вучні Твае бачылі
справы Твае, якія Ты робіш.
4 Бо ніхто нічога таемна ня робіць, і сам імкнецца быць вядомым. Калі робіш гэткае, зьяві Сябе
сьвету».
5 Бо і браты Ягоныя таксама ня верылі ў Яго.
6 Ісус жа кажа ім: «Час Мой яшчэ не прыйшоў, а для вас заўсёды час.
7 Вас сьвет ня можа ненавідзець, а Мяне ненавідзіць, бо Я сьведчу пра яго, што справы ягоныя
злыя.
8 Вы ідзіце на гэтае сьвята, а Я яшчэ не пайду на гэтае сьвята, бо час Мой яшчэ ня споўніўся».
9 Сказаўшы ім гэта, застаўся ў Галілеі.
10 Калі ж пайшлі браты Ягоныя, тады і Ён пайшоў на сьвята, ня яўна, але як быццам таемна.
11 А Юдэі шукалі Яго на сьвяце і гаварылі: «Дзе Ён?»
12 І шмат размоваў было адносна Яго ў натоўпах: адны казалі, што Ён добры, а другія казалі:
«Не, бо Ён падманвае грамаду».
13 Аднак ніхто не гаварыў адносна Яго яўна дзеля страху перад Юдэямі.
14 Але ў палове сьвята Ісус увайшоў у сьвятыню і навучаў.
15 І зьдзіўляліся Юдэі, кажучы: «Як Ён ведае Пісаньні, не вучыўшыся?»
16 Адказаў ім Ісус і сказаў: «Маё вучэньне не Маё, але Таго, Хто паслаў Мяне.
17 Калі хто хоча выконваць волю Яго, той зразумее адносна вучэньня гэтага, ці ад Бога яно, ці
Я ад Сябе гавару.
18 Хто гаворыць сам ад сябе, той шукае сваёй славы, а Хто шукае славы Таго, Хто паслаў Яго,
Той праўдзівы, і няма ў Ім няправеднасьці.
19 Ці ня даў вам Майсей Закону? І ніхто з вас не выконвае Закон. За што шукаеце забіць Мяне?»

20 Натоўп адказаў і сказаў: «Дэмана Ты маеш. Хто шукае забіць Цябе?»
21 Адказаў Ісус і сказаў ім: «Адну справу Я зрабіў, і вы ўсе зьдзіўляецеся.
22 Майсей даў вам абразаньне; хоць яно і не ад Майсея, але ад бацькоў, і ў суботу вы абразаеце чалавека.
23 Калі ў суботу абразаецца чалавек, каб ня быў парушаны закон Майсееў, чаму ж вы незадаволеныя Мною, што Я ўсяго чалавека зрабіў здаровым у суботу?
24 Не судзіце па зьнешнасьці, але судзіце судом справядлівым».
25 Казалі тады некаторыя з Ерусалімцаў: «Ці ж гэта ня Той, Якога шукаюць, каб забіць?
26 І вось Ён яўна гаворыць, і нічога ня кажуць Яму. Ці не пераканаліся начальнікі, што Ён сапраўды Хрыстос?
27 Але мы ведаем Яго, адкуль Ён. Калі ж прыйдзе Хрыстос, ніхто ня будзе ведаць, адкуль Ён».
28 Усклікнуў тады Ісус у сьвятыні, навучаючы і кажучы: «І Мяне ведаеце, і ведаеце адкуль Я, і Я прыйшоў ня Сам ад Сябе, але праўдзівы Той, Які паслаў Мяне, Якога вы ня ведаеце.
29 А Я ведаю Яго, бо Я ад Яго, і Ён Мяне паслаў».
30 І шукалі, каб схапіць Яго, і ніхто не ўзлажыў на Яго рукі, бо яшчэ не прыйшла гадзіна Ягоная.
31 Многія ж з натоўпу паверылі ў Яго і казалі: «Хрыстос, калі прыйдзе, няўжо ўчыніць больш знакаў, чым Гэты ўчыніў?»
32 Пачулі фарысэі натоўп, які гэтак гаварыў адносна Яго; і паслалі фарысэі і першасьвятары паслугачоў, каб схапілі Яго.
33 Ісус жа сказаў ім: «Яшчэ трохі часу Я буду з вамі, і пайду да Таго, Які паслаў Мяне.
34 Будзеце шукаць Мяне і ня знойдзеце, і дзе Я буду, вы ня можаце прыйсьці».
35 Гаварылі тады Юдэі між сабою: «Куды Ён мае ісьці, што мы ня знойдзем Яго? Ці ня мае Ён ісьці да грэцкага расьцярушаньня і навучаць Грэкаў?
36 Што мае значыць гэтае слова, якое Ён сказаў: “Будзеце шукаць Мяне і ня знойдзеце, і дзе Я буду, вы ня можаце прыйсьці”? »
37 А ў апошні вялікі дзень сьвята Ісус стаяў і ўсклікнуў, кажучы: «Калі хто смагне, няхай прыйдзе да Мяне і п’е.
38 Хто верыць у Мяне, як сказана ў Пісаньні, у таго з жывата пацякуць рэкі вады жывое».
39 Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго, бо не было яшчэ Духа Сьвятога, бо ня быў яшчэ Ісус праслаўлены.
40 Многія з натоўпу, пачуўшы гэта слова, казалі: «Ён, сапраўды, — прарок».
41 Другія казалі: «Ён — Хрыстос». А іншыя казалі: «Хіба з Галілеі прыйдзе Хрыстос?
42 Ці ж не сказана ў Пісаньні, што з насеньня Давідавага і з Бэтлеему, мястэчка, адкуль быў Давід, прыйдзе Хрыстос?»
43 І стаўся дзеля Яго падзел у натоўпе.
44 А некаторыя з іх хацелі схапіць Яго, але ніхто не ўзлажыў на Яго рукі.
45 Тады вярнуліся паслугачы да першасьвятароў і фарысэяў, і тыя сказалі ім: «Чаму вы не прывялі Яго?»
46 Паслугачы адказалі: «Ніколі чалавек не гаварыў так, як Гэты Чалавек».
47 Фарысэі тады адказалі ім: «Няўжо і вы падманутыя?
48 Ці паверыў у Яго хто з начальнікаў ці з фарысэяў?
49 Але гэты натоўп, які ня ведае Закону, ён пракляты».
50 Кажа ім Нікадэм, адзін з іх, які прыходзіў да Яго ўначы:
51 «Няўжо судзіць наш Закон чалавека, ня выслухаўшы яго спачатку і не даведаўшыся, што ён робіць?»
52 Адказалі і сказалі яму: «Няўжо і ты з Галілеі? Дасьледуй і пабач, што з Галілеі прарок не паўставаў».
53 І пайшоў кожны ў дом свой.

Ян 8

1 Ісус жа пайшоў на гару Аліўную.
2 Нараніцы Ён ізноў прыйшоў у сьвятыню, і ўвесь народ ішоў да Яго. І, сеўшы, Ён вучыў іх.
3 Тут кніжнікі і фарысэі прыводзяць да Яго жанчыну, злоўленую на чужалоستве, і, паставіўшы
яе пасярэдзіне,
4 кажуць Яму: «Настаўнік, гэтая жанчына злоўленая на чужалоستве.
5 Майсей жа ў Законе загадаў нам гэткіх каменаваць. А Ты што скажаш?»
6 Казалі ж яны гэта, спакушаючы Яго, каб мець у чым абвінаваціць Яго. А Ісус, нізка
нахіліўшыся, пісаў пальцам на зямлі.
7 Калі ж яны працягвалі пытацца ў Яго, Ён, выпрастаўшыся, сказаў ім: «Хто з вас бязгрэшны,
няхай першы кіне камень у яе».
8 І, зноў нізка нахіліўшыся, пісаў на зямлі.
9 Яны ж, пачуўшы гэтае і дакараныя сумленьнем, павыходзілі адзін за адным, пачаўшы ад
старшыняў, аж да апошніх. І застаўся адзін Ісус і жанчына, што стаяла пасярэдзіне.
10 Ісус выпрастаўся, і, ня бачачы нікога, акрамя жанчыны, сказаў ёй: «Жанчына! Дзе тыя, хто
абвінавачваў цябе? Ніхто не асудзіў цябе?»
11 Яна сказала: «Ніхто, Госпадзе!» Ісус жа сказаў ёй: «І Я не асуджаю цябе; ідзі і больш не
грашы».
12 Тады ізноў сказаў Ісус да іх, кажучы: «Я — сьвятло сьвету. Хто ідзе за Мною, той ня будзе
хадзіць у цемры, але будзе мець сьвятло жыцьця».
13 Тады фарысэі сказалі Яму: «Ты Сам пра Сябе сьведчыш, непраўдзівае сьведчаньне Тваё».
14 Адказаў Ісус і сказаў ім: «Калі Я і Сам пра Сябе сьведчу, праўдзівае сьведчаньне Маё, бо Я
ведаю, адкуль прыйшоў і куды іду; а вы ня ведаеце, адкуль Я прыходжу і куды іду.
15 Вы судзіце паводле цела; Я не суджу нікога.
16 А калі Я і суджу, суд Мой праўдзівы, бо Я не адзін, але Я і Айцец, Які паслаў Мяне.
17 І ў Законе вашым напісана, што сьведчаньне двух чалавек праўдзівае.
18 Я Сам сьведчу пра Сябе, і сьведчыць пра Мяне Айцец, Які паслаў Мяне».
19 Тады сказалі Яму: «Дзе Айцец Твой?» Адказаў Ісус: «Вы ня ведаеце ані Мяне, ані Айца
Майго. Калі б вы ведалі Мяне, ведалі б і Айца Майго».
20 Гэтыя словы гаварыў Ісус ля скарбніцы, калі навучаў у сьвятыні; і ніхто не схапіў Яго, бо
яшчэ не прыйшла гадзіна Ягоная.
21 Зноў жа сказаў ім Ісус: «Я іду, і будзеце шукаць Мяне; і паўміраеце ў грэху вашым. Куды Я
іду, вы прыйсьці ня можаце».
22 Юдэі ж казалі: «Ці не заб'е Ён Сябе Сам, бо кажа: "Куды Я іду, вы ня можаце прыйсьці"?»
23 І сказаў Ён ім: «Вы — з нізу, а Я — з вышыні; вы — з гэтага сьвету, Я — ня з гэтага сьвету.
24 Таму сказаў Я вам, што вы паўміраеце ў грахах вашых; бо калі не паверыце, што гэта Я,
паўміраеце ў грахах вашых».
25 Тады яны сказалі Яму: «Хто ж Ты?» І сказаў ім Ісус: «Адпачатны, як і кажу вам.
26 Шмат маю казаць пра вас і судзіць, але Той, Які паслаў Мяне, праўдзівы, і што Я чуў ад Яго,
тое і кажу сьвету».
27 Яны не зразумелі, што Ён казаў ім пра Айца.
28 Тады сказаў ім Ісус: «Калі падымеце Сына Чалавечага, тады даведаецеся, што гэта Я і што
нічога не раблю ад Сябе, але як навучыў Мяне Айцец Мой, так і кажу.
29 І Той, Які паслаў Мяне, разам са Мною. Айцец не пакінуў Мяне аднаго, бо Я заўсёды раблю
тое, што падабаецца Яму».
30 Калі ён гаварыў гэтае, многія паверылі ў Яго.
31 Тады сказаў Ісус Юдэям, якія паверылі ў Яго: «Калі застанецеся ў слове Маім, дык сапраўды
вы — вучні Мае.
32 І спазнаеце праўду, і праўда вызваліць вас».
33 Яму адказалі: «Мы — насеньне Абрагама і нікому ніколі не былі нявольнікамі. Як жа Ты
кажаш: "Станецеся вольнымі"?».

34 Адказаў ім Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: усякі, хто робіць грэх, ёсьць нявольнік грэху.
35 Але нявольнік не жыве ў доме вечна, сын застаецца вечна.
36 Дык вось, калі Сын вызваліць вас, праўдзіва станецеся вольнымі.
37 Ведаю, што вы — насеньне Абрагама, але вы шукаеце, каб забіць Мяне, бо слова Маё не зьмяшчаецца ў вас.
38 Я кажу тое, што бачыў у Айца Майго, а вы робіце тое, што бачылі ў айца вашага».
39 Яны адказалі і сказалі Яму: «Бацька наш — Абрагам». Кажа ім Ісус: «Калі б вы былі дзеці Абрагама, дык рабілі б справы Абрагама.
40 А цяпер вы шукаеце, каб забіць Мяне, Чалавека, Які сказаў вам праўду, якую чуў ад Бога. Абрагам гэтага не рабіў.
41 Вы робіце справы бацькі вашага». Тады сказалі Яму: «Мы не з распусты народжаныя; аднаго Айца маем, Бога».
42 Ісус тады сказаў ім: «Калі б Бог быў ваш Айцец, дык вы любілі б Мяне, бо Я з Бога выйшаў і прыходжу; бо Я ня Сам ад Сябе прыйшоў, але Ён паслаў Мяне.
43 Чаму вы не разумееце гаворкі Маёй? Бо ня можаце чуць слова Маё.
44 Ваш бацька — д'ябал, і вы хочаце выконваць пажаданьні бацькі вашага. Ён быў чалавеказабойца ад пачатку і ня вытрываў у праўдзе, бо няма ў ім праўды. Калі ён гаворыць хлусьню, гаворыць сваё, бо ён — хлус і бацька хлусьні.
45 А калі Я кажу праўду, вы ня верыце Мне.
46 Хто з вас давядзе Мой грэх? Калі ж Я кажу праўду, чаму вы ня верыце Мне?
47 Хто ад Бога, той слухае словы Божыя; вы таму ня слухаеце, што вы не ад Бога».
48 Адказалі тады Юдэі і сказалі Яму: «Ці ж ня слушна мы кажам, што Ты — Самаранін і дэмана маеш?»
49 Адказаў Ісус: «Я дэмана ня маю, але Я шаную Айца Майго, а вы зьневажаеце Мяне.
50 Але Я не шукаю Сваёй славы; ёсьць Той, Хто шукае і судзіць.
51 Сапраўды, сапраўды кажу вам: хто захавае слова Маё, ня ўбачыць сьмерці на вякі».
52 Тады сказалі Яму Юдэі: «Цяпер мы ведаем, што маеш дэмана. Абрагам памёр, і прарокі, а Ты кажаш: хто захавае слова Маё, не пакаштуе смерці на вякі.
53 Няўжо Ты большы за бацьку нашага Абрагама, які памёр, і прарокі памерлі? Кім Ты Сябе робіш?»
54 Адказаў Ісус: «Калі Я Сам Сябе праслаўляю, дык слава Мая — нішто. Мяне праслаўляе Айцец Мой, пра Якога вы кажаце, што Ён — Бог ваш.
55 І вы не спазналі Яго, а Я ведаю Яго, і калі скажу, што ня ведаю Яго, буду падобны да вас хлус. Але Я ведаю Яго і захоўваю слова Ягонае.
56 Абрагам, бацька ваш, рады быў бачыць дзень Мой; і ўбачыў, і ўзрадаваўся».
57 Тады сказалі Яму Юдэі: «Табе няма яшчэ пяцідзесяці гадоў, і Ты бачыў Абрагама?»
58 Сказаў ім Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: перш, чым Абрагам быў, Я ёсьць».
59 Узялі тады камяні, каб кінуць у Яго, але Ісус схаваўся і выйшаў са сьвятыні, прайшоўшы між імі, і пайшоў далей.

Ян 9

1 І, праходзячы, убачыў чалавека, сьляпога ад нараджэньня.
2 І спыталіся ў Яго вучні Ягоныя, кажучы: «Раббі! Хто саграшыў: ён ці бацькі ягоныя, што ён нарадзіўся сьляпы?»
3 Адказаў Ісус: «Не саграшыў ані ён, ані бацькі ягоныя, але каб былі выяўленыя праз яго справы Божыя.
4 Мне трэба рабіць справу Таго, Хто паслаў Мяне, пакуль дзень; прыходзіць ноч, калі ніхто ня можа рабіць.
5 Пакуль Я ў сьвеце, Я —сьвятло сьвету».

6 Сказаўшы гэта, Ён плюнуў на зямлю, зрабіў са сьліны балота і памазаў балотам вочы сьляпому,
7 і сказаў яму: «Ідзі, абмыйся ў сажалцы Сілаам, — што перакладаецца Пасланы». Тады той пайшоў, і абмыўся, і прыйшоў відушчы.
8 Суседзі ж і тыя, што бачылі яго раней, як быў сьляпы, казалі: «Ці ж ня той гэта, які сядзеў і жабраваў?»
9 Адны казалі: «Гэта ён», а іншыя: «Падобны да яго». Ён жа сказаў: «Гэта я».
10 Тады сказалі яму: «Як адчыніліся вочы твае?»
11 Адказаў ён і сказаў: «Чалавек, называны Ісус, зрабіў балота, памазаў вочы мае і сказаў мне: “Ідзі да сажалкі Сілаам і абмыйся”. Я пайшоў, абмыўся і стаў бачыць».
12 Тады сказалі яму: «Дзе Ён?» Ён кажа: «Ня ведаю».
13 Вядуць гэтага былога сьляпога да фарысэяў.
14 А была субота, калі Ісус зрабіў балота і адчыніў яму вочы.
15 Тады ізноў спыталіся ў яго фарысэі, як ён стаў бачыць. Ён жа сказаў ім: «Балота палажыў Ён на вочы мае, і я абмыўся, і бачу».
16 Сказалі тады некаторыя з фарысэяў: «Не ад Бога Гэты Чалавек, бо Ён не захоўвае суботы». Іншыя казалі: «Як можа чалавек грэшны рабіць гэткія знакі?» І быў падзел між імі.
17 Зноў кажуць сьляпому: «Што ты скажаш пра Яго, бо Ён адчыніў табе вочы?» Той гаворыць: «Гэта прарок».
18 Юдэі тады не паверылі, што ён быў сьляпы і стаў бачыць, пакуль не паклікалі бацькоў гэтага [чалавека], які стаў бачыць,
19 і спыталіся ў іх, кажучы: «Ці гэта сын ваш, пра якога вы кажаце, што ён нарадзіўся сьляпы? Як жа ён цяпер бачыць?»
20 Бацькі ягоныя адказалі ім і сказалі: «Мы ведаем, што ён — наш сын, і што ён нарадзіўся сьляпы.
21 А як цяпер бачыць, ня ведаем, таксама, хто адчыніў яму вочы, мы ня ведаем. Ён дарослы, яго спытайцеся; няхай сам пра сябе скажа».
22 Так казалі бацькі ягоныя, таму што баяліся Юдэяў, бо Юдэі ўжо дамовіліся, каб калі хто прызнае Яго за Хрыста, адлучыць ад сынагогі.
23 Дзеля гэтага бацькі ягоныя сказалі: «Ён дарослы, яго спытайцеся».
24 Тады другі раз паклікалі таго чалавека, які быў сьляпы, і сказалі яму: «Аддай славу Богу. Мы ведаем, што Чалавек Той — грэшнік».
25 Ён жа адказаў і сказаў: «Ці Ён — грэшнік, ня ведаю. Адно ведаю, што я быў сьляпы, а цяпер бачу».
26 Дык ізноў сказалі яму: «Што Ён зрабіў табе? Як Ён адчыніў твае вочы?»
27 Адказаў ім: «Я ўжо казаў вам, і вы ня слухалі. Што яшчэ хочаце пачуць? Няўжо і вы хочаце стацца вучнямі Ягонымі?»
28 Тады насварыліся на яго і сказалі: «Гэта ты — Ягоны вучань, а мы — вучні Майсея.
29 Мы ведаем, што з Майсеем гаварыў Бог, а Гэтага ня ведаем, адкуль Ён».
30 Адказаў чалавек той і сказаў ім: «Гэта і дзіўна, што вы ня ведаеце, адкуль Ён, а Ён адчыніў мае вочы.
31 Мы ж ведаем, што грэшнікаў Бог ня слухае; але хто пакланяецца Богу і волю Ягоную выконвае, таго слухае.
32 Ад веку не чуваць было, каб хто адчыніў вочы народжанаму сьляпым.
33 Калі б Ён ня быў ад Бога, ня мог бы нічога ўчыніць».
34 Адказалі і сказалі яму: «У грахах ты ўвесь нарадзіўся, і ты нас вучыш?» І выгналі яго прэч.
35 Пачуў Ісус, што выгналі яго прэч, і, знайшоўшы яго, сказаў яму: «Ці верыш ты ў Сына Божага?»
36 Той адказаў і сказаў: «А хто Ён, Пане, каб мне верыць у Яго?»
37 Ісус жа сказаў яму: «І ты бачыў Яго, і Той, Які гаворыць з табою, — гэта Ён».
38 Ён жа сказаў: «Веру, Госпадзе!» І пакланіўся Яму.

39 І сказаў Ісус: «На суд прыйшоў Я ў сьвет гэты, каб тыя, што ня бачаць, бачылі, а тыя, што
бачаць, зрабіліся сьляпыя».
40 І пачулі гэта тыя з фарысэяў, якія былі з Ім, і сказалі Яму: «Няўжо і мы сьляпыя?»
41 Ісус сказаў ім: «Калі б вы былі сьляпыя, ня мелі б грэху. Але цяпер вы кажаце, што бачыце,
таму грэх ваш застаецца.

Ян 10

1 Сапраўды, сапраўды кажу вам: хто не дзьвярыма ўваходзіць у авечы двор, але ўлазіць іначай,
той злодзей і разбойнік.
2 А хто ўваходзіць дзьвярыма, той — пастыр авечак.
3 Яму прыдзьвернік адчыняе, і авечкі слухаюць голас ягоны, і ён кліча сваіх авечак па імёнах,
і выводзіць іх.
4 І калі выведзе сваіх авечак, ідзе перад імі, і авечкі ідуць за ім, бо ведаюць голас ягоны.
5 За чужым жа ня пойдуць, але ўцякуць ад яго, бо ня ведаюць чужога голасу».
6 Гэтую прыказку сказаў ім Ісус, але яны не зразумелі, што такое Ён гаварыў ім.
7 Тады ізноў сказаў ім Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам, што Я — дзьверы авечак.
8 Усе, якія прыходзілі раней за Мяне, — злодзеі і разбойнікі, але авечкі не паслухаліся іх.
9 Я — дзьверы. Хто ўвойдзе праз Мяне, збаўлены будзе, і ўвойдзе, і выйдзе, і пашу знойдзе.
10 Злодзей прыходзіць, каб толькі ўкрасьці, забіць і загубіць. Я прыйшоў, каб вы мелі жыцьцё
і мелі ўдосталь.
11 Я — Пастыр добры. Добры пастыр аддае душу сваю за авечак,
12 а найміт, які ня пастыр, для якога авечкі не свае, бачыць, што прыходзіць воўк, і пакідае
авечак, і ўцякае, і воўк хапае іх, і разганяе авечак.
13 Найміт жа ўцякае, бо ён найміт і ня рупіцца пра авечак.
14 Я — Пастыр добры і ведаю, хто Мае, і Мае ведаюць Мяне.
15 Як Айцец ведае Мяне, і Я ведаю Айца, і душу Маю аддаю за авечак.
16 Маю Я і іншых авечак, якія ня з гэтага двара, і іх Я мушу прывесьці. І яны пачуюць голас
Мой, і станецца адзін статак і адзін Пастыр.
17 За тое любіць Мяне Айцец, што Я аддаю душу Маю, каб ізноў узяць яе.
18 Ніхто не забірае яе ў Мяне, але Я Сам аддаю яе. Маю ўладу аддаць яе і маю ўладу ізноў узяць
яе. Гэтае прыказаньне атрымаў Я ад Айца Майго».
19 Тады ізноў стаўся падзел між Юдэямі дзеля гэтых словаў.
20 Многія з іх казалі: «Ён мае дэмана і вар'яцее; што вы слухаеце Яго?»
21 Другія казалі: «Гэта словы не апанаванага дэманам. Ці ж можа дэман адчыняць вочы
сьляпым?»
22 І сталася ў Ерусаліме сьвята Абнаўленьня, і была зіма.
23 І хадзіў Ісус у сьвятыні ў прысенку Салямонавым.
24 Тады абступілі Яго Юдэі і сказалі Яму: «Дакуль будзеш трымаць душу нашу? Калі Ты —
Хрыстос, скажы нам адкрыта».
25 Адказаў ім Ісус: «Я казаў вам, і ня верыце; справы, якія Я раблю ў імя Айца Майго, яны
сьведчаць пра Мяне.
26 Але вы ня верыце, бо вы не з Маіх авечак, як Я сказаў вам.
27 Авечкі Мае слухаюць голас Мой, і Я ведаю іх, і яны ідуць за Мною.
28 І Я даю ім жыцьцё вечнае, і не загінуць на вякі, і ніхто ня выхапіць іх з рукі Маёй.
29 Айцец Мой, Які даў Мне іх, большы за ўсіх, і ніхто ня можа выхапіць іх з рукі Айца Майго.
30 Я і Айцец — адно».
31 Тады ізноў Юдэі ўзялі камяні, каб укаменаваць Яго.
32 Адказаў ім Ісус: «Шмат добрых учынкаў паказаў Я вам ад Айца Майго. За які з іх хочаце
Мяне ўкаменаваць?»
33 Юдэі адказалі Яму, кажучы: «Не за добры ўчынак хочам укаменаваць Цябе, але за
блюзьнерства, і што Ты, будучы чалавекам, робіш Сябе Богам».

34 Ісус адказаў ім: «Ці не напісана ў Законе вашым: “Я сказаў: ‘Вы — богі’ ”?
35 Калі Ён назваў багамі тых, да якіх было слова Божае, і ня можа быць парушана Пісаньне,
36 як Таму, Каго Айцец асьвяціў і паслаў у сьвет, вы кажаце: “Блюзьніш”, таму што сказаў: “Я — Сын Божы”?
37 Калі Я не раблю ўчынкаў Айца Майго, ня верце Мне.
38 Калі ж раблю, а вы Мне ня верыце, дык верце ўчынкам Маім, каб спазналі і паверылі, што Айцец у-ва Мне, і Я ў Ім».
39 Тады ізноў шукалі схапіць Яго, але Ён выйшаў з рук іхніх
40 і пайшоў ізноў за Ярдан, у тое месца, дзе раней хрысьціў Ян, і застаўся там.
41 І многія прыйшлі да Яго, і казалі, што Ян не ўчыніў ніводнага знаку, але ўсё, што сказаў Ян пра Яго, было праўдзівым.
42 І многія там паверылі ў Яго.

Ян 11

1 Быў жа нейкі хворы Лазар з Бэтаніі, мястэчка Марыі і Марты, сястры ейнай.
2 А Марыя, якой брат Лазар быў хворы, была тая, якая памазала Госпада мірам і абцерла ногі Ягоныя валасамі сваімі.
3 Дык сёстры паслалі да Яго, кажучы: «Госпадзе! Вось той, з кім Ты сябруеш, нядужы».
4 Ісус, пачуўшы, сказаў: «Гэтая нядужасьць не на сьмерць, але на славу Божую, каб Сын Божы быў праслаўлены праз яе».
5 А Ісус любіў Марту, і сястру ейную, і Лазара.
6 Калі ж пачуў, што той хворы, дык заставаўся два дні ў тым месцы, дзе знаходзіўся.
7 Пасьля гэтага кажа вучням: «Пойдзем ізноў у Юдэю».
8 Вучні кажуць Яму: «Раббі! Толькі што Юдэі шукалі ўкаменаваць Цябе, і Ты ізноў ідзеш туды?»
9 Ісус адказаў: «Ці не дванаццаць гадзінаў мае дзень? Хто ходзіць удзень, не спатыкаецца, бо бачыць сьвятло гэтага сьвету,
10 а хто ходзіць уначы, спатыкаецца, бо сьвятла няма ў ім».
11 Сказаў гэта, і пасьля кажа ім: «Лазар, сябра наш, заснуў, але Я іду пабудзіць яго».
12 Сказалі тады вучні Ягоныя: «Госпадзе! Калі заснуў, будзе здаровы».
13 Ісус жа гаварыў пра сьмерць ягоную, а яны думалі, што Ён кажа пра сонны супачынак.
14 Тады Ісус сказаў ім адкрыта: «Лазар памёр;
15 і Я радуюся дзеля вас, што Я ня быў там, каб вы паверылі; але пойдзем да яго».
16 Тады Тамаш, называны Блізьнюк, сказаў таварышам-вучням: «Пойдзем і мы, каб памерці з ім».
17 Прыйшоўшы, Ісус знайшоў, што ён ужо чатыры дні ў магіле.
18 Бэтанія ж была блізка ад Ерусаліму, каля пятнаццаці стадыяў.
19 І шмат Юдэяў прыйшлі да Марты і Марыі пацешыць іх па браце іхнім.
20 Марта, калі пачула, што ідзе Ісус, выйшла напярэймы Яму, а Марыя сядзела ў доме.
21 Тады Марта сказала Ісусу: «Госпадзе! Калі б Ты быў тут, не памёр бы брат мой.
22 Але і цяпер ведаю, што чаго Ты папросіш у Бога, дасьць Табе Бог».
23 Кажа ёй Ісус: «Уваскрэсьне брат твой».
24 Кажа Яму Марта: «Ведаю, што ўваскрэсьне ва ўваскрасеньне, у апошні дзень».
25 Ісус сказаў ёй: «Я ёсьць уваскрасеньне і жыцьцё. Хто верыць у Мяне, хоць і памрэ, жыць будзе.
26 І ўсякі, хто жыве і верыць у Мяне, не памрэ на вякі. Ці верыш гэтаму?»
27 Яна кажа Яму: «Так, Госпадзе! Я веру, што Ты — Хрыстос, Сын Божы, Які прыходзіць у сьвет».
28 І, сказаўшы гэтае, пайшла і паклікала цішком Марыю, сястру сваю, кажучы: «Настаўнік прыйшоў і кліча цябе».
29 Яна, як толькі пачула, хутка ўстала і пайшла да Яго.
30 Ісус жа яшчэ не ўвайшоў у мястэчка, але быў на тым месцы, дзе пераняла Яго Марта.

31 Юдэі ж, што былі з ёю ў доме і пацяшалі яе, бачачы, што Марыя хутка ўстала і выйшла,
пайшлі за ёю, кажучы, што ідзе на магілу плакаць там.
32 Марыя ж, калі прыйшла туды, дзе быў Ісус, убачыўшы Яго, упала да ног Ягоных, кажучы
Яму: «Госпадзе! Калі б Ты быў тут, не памёр бы брат мой».
33 Ісус, калі ўбачыў, што яна плача і што плачуць Юдэі, якія з ёй прыйшлі, уздыхнуў у духу, і
ўсхваляваўся,
34 і сказаў: «Дзе вы палажылі яго?» Кажуць Яму: «Госпадзе! Прыйдзі і паглядзі».
35 Ісус заплакаў.
36 Казалі тады Юдэі: «Глядзі, як Ён любіў яго».
37 А некаторыя з іх сказалі: «Ці ня мог Ён, Які адчыніў вочы сьляпому, зрабіць, каб і гэты не
памёр?»
38 Ісус жа, ізноў уздыхнуўшы ў духу, прыходзіць да магілы. Была ж гэта пячора, і камень ляжаў
на ёй.
39 Кажа Ісус: «Падыміце камень!» Кажа Яму сястра нябожчыка, Марта: «Госпадзе, ужо
сьмярдзіць, бо ўжо чацьвёрты дзень».
40 Кажа ёй Ісус: «Ці не казаў Я табе, што, калі будзеш верыць, угледзіш славу Божую?»
41 Тады паднялі камень, дзе ляжаў нябожчык. А Ісус падняў вочы ўгору і сказаў: «Ойча, дзякую
Табе, што Ты пачуў Мяне.
42 Бо Я ведаю, што Ты заўсёды чуеш Мяне, але Я сказаў дзеля натоўпу, які тут стаіць, каб яны
паверылі, што Ты паслаў Мяне».
43 І, сказаўшы гэтае, крыкнуў моцным голасам: «Лазар! Выйдзі вонкі!»
44 І выйшаў нябожчык са зьвязанымі пахавальнай тканінай нагамі і рукамі, і твар ягоны быў
абвязаны хусткаю. Кажа ім Ісус: «Разьвяжыце яго і дайце хадзіць».
45 Тады многія з Юдэяў, якія прыйшлі да Марыі і бачылі, што ўчыніў Ісус, паверылі ў Яго.
46 А некаторыя з іх пайшлі да фарысэяў і сказалі ім, што зрабіў Ісус.
47 Тады першасьвятары і фарысэі склікалі сынэдрыён і казалі: «Што нам рабіць? Гэты Чалавек
робіць шмат знакаў.
48 Калі пакінем Яго гэтак, дык усе паверaць у Яго, і прыйдуць Рымляне, і забяруць месца [гэтае]
і народ».
49 Адзін жа з іх, нехта Каяфа, які быў той год першасьвятаром, сказаў ім: «Вы нічога ня ведаеце,
50 і ня думаеце, што карысьней для нас, каб адзін чалавек памёр за народ, чым каб увесь народ
загінуў».
51 Гэтае ж ён сказаў не ад сябе, але, быўшы той год першасьвятаром, прарочыў, што Ісус мае
памерці за народ,
52 і ня толькі за народ, але каб і расьцярушаных дзяцей Божых сабраць у адно.
53 Ад гэтага дня яны пастанавілі, каб забіць Яго.
54 Тады Ісус ужо не хадзіў адкрыта між імі, але пайшоў адтуль у краіну ля пустыні, у горад,
называны Эфраім, і там заставаўся з вучнямі Сваімі.
55 Была ж блізка Пасха юдэйская, і з усяго Краю многія ўзыйшлі ў Ерусалім перад Пасхай, каб
ачысьціцца.
56 Тады шукалі Ісуса і, стоячы ў сьвятыні, гаварылі між сабою: «Як вы думаеце, ці ня прыйдзе
Ён на сьвята?»
57 А першасьвятары і фарысэі далі загад, каб кожны, хто даведаецца, дзе Ён, паведаміў, каб
схапіць Яго.

Ян 12

1 За шэсьць дзён да Пасхі прыйшоў Ісус у Бэтанію, дзе быў Лазар нябожчык, якога Ён уваскрасіў
з мёртвых.
2 Там прыгатавалі Яму вячэру, і Марта паслугавала, а Лазар быў адным з тых, што ўзьлягалі з
Ім.
3 Марыя ж, узяўшы фунт міра нардовага, чыстага і каштоўнага, памазала ногі Ісуса і выцерла
валасамі сваімі ногі Ягоныя, а дом напоўніўся водарам ад міра.

4 Кажа тады адзін з вучняў Ягоных, Юда Сымонаў Іскарыёт, які меўся выдаць Яго:
5 «Чаму не прадалі гэтае міра за трыста дынараў і не раздалі ўбогім?»
6 Казаў жа ён гэта не таму, што клапаціўся пра ўбогіх, але таму, што быў злодзей і меў каліту,
і браў тое, што [туды] кідалі.
7 Ісус тады сказаў: «Пакіньце яе. Яна захавала яго на дзень пахаваньня Майго,
8 бо ўбогіх заўсёды маеце з сабою, а Мяне не заўсёды».
9 Тады вялікі натоўп з Юдэяў даведаўся, што Ён там, і прыйшлі ня толькі дзеля Ісуса, але і каб
Лазара пабачыць, якога Ён уваскрасіў з мёртвых.
10 А першасьвятары пастанавілі забіць і Лазара,
11 бо дзеля яго шмат Юдэяў прыходзіла і паверыла ў Ісуса.
12 На заўтра вялікі натоўп, які прыйшоў на сьвята, пачуў, што Ісус прыходзіць у Ерусалім,
13 і ўзялі пальмовыя галінкі, і выйшлі на спатканьне Яму, і крычалі: «Гасанна! Дабраслаўлёны
Той, Які прыходзіць у імя Госпада, Валадар Ізраіля!»
14 Ісус жа, знайшоўшы маладога асла, сеў на яго, як напісана:
15 «Ня бойся, дачка Сыёну! Вось, Валадар твой прыходзіць, седзячы на асьляняці».
16 Вучні Ягоныя перш не разумелі гэтага, але калі Ісус быў праслаўлены, тады яны ўзгадалі,
што гэтак было напісана пра Яго і гэтак зрабілі Яму.
17 Натоўп жа, які быў з Ім, сьведчыў тады, што Ён выклікаў з магілы Лазара і ўваскрасіў яго з
мёртвых.
18 Таму і пераняў Яго натоўп, бо чуў, што Ён зрабіў гэты знак.
19 Фарысэі ж гаварылі між сабою: «Глядзіце, нічога не атрымліваецца! Вось, сьвет пайшоў за
Ім».
20 Былі ж некаторыя Грэкі сярод тых, якія прыйшлі пакланіцца на сьвята.
21 Яны падыйшлі да Філіпа, які быў з Бэтсаіды Галілейскае, і прасілі яго, кажучы: «Пане, мы
хочам бачыць Ісуса».
22 Філіп ідзе і кажа Андрэю; і пасьля Андрэй і Філіп кажуць Ісусу.
23 А Ісус адказаў ім, кажучы: «Прыйшла гадзіна, каб быў праслаўлены Сын Чалавечы.
24 Сапраўды, сапраўды кажу вам: калі пшанічнае зерне, упаўшы ў зямлю, не памрэ, то
застанецца адно, а калі памрэ, то прыносіць шмат плоду.
25 Хто любіць душу сваю, загубіць яе; а той, хто ненавідзіць душу сваю ў гэтым сьвеце, захавае
яе ў жыцьцё вечнае.
26 Хто Мне служыць, няхай ідзе за Мною; і дзе Я, там і служыцель Мой будзе; і хто Мне служыць,
таго ўшануе Айцец.
27 Цяпер душа Мая ўстрывожана; і што Я скажу? Ойча, збаў Мяне ад гэтае гадзіны; але ж дзеля
гэтае гадзіны Я і прыйшоў.
28 Ойча, праслаў імя Тваё!» Тады прыйшоў голас з неба: «І праславіў, і яшчэ праслаўлю».
29 Натоўп, які стаяў і чуў, казаў: «Былі грымоты». Іншыя казалі: «Анёл прамовіў да Яго».
30 Адказаў Ісус і сказаў: «Ня дзеля Мяне быў гэты голас, але дзеля вас.
31 Цяпер суд сьвету гэтаму; цяпер князь гэтага сьвету выгнаны будзе прэч.
32 І Я, калі буду падняты з зямлі, усіх прыцягну да Сябе».
33 Сказаў жа Ён гэтае, даючы знак, якою сьмерцю мае памерці.
34 Натоўп адказваў Яму: «Мы чулі з Закону, што Хрыстос застаецца вечна. Дык як жа Ты кажаш,
што мусіць быць падняты Сын Чалавечы? Хто гэты Сын Чалавечы?»
35 Тады сказаў ім Ісус: «Яшчэ на кароткі час сьвятло з вамі. Хадзіце, пакуль маеце сьвятло, каб
цемра вас не агарнула; а хто ходзіць у цемры, той ня ведае, куды ідзе.
36 Пакуль маеце сьвятло, верце ў сьвятло, каб сталіся вы сынамі сьвятла». Гэта сказаў Ісус і,
адыйшоўшы, схаваўся ад іх.
37 Хоць гэтулькі знакаў учыніў Ён перад імі, яны не паверылі ў Яго,
38 каб споўнілася слова Ісаі прарока, якое той сказаў: «Госпадзе! Хто паверыў пачутаму ад
нас, і каму было адкрытае рамяно Госпада?»
39 Дзеля гэтага не маглі яны верыць, бо ізноў сказаў Ісая:

40 «Ён засьляпіў вочы іхнія і сэрца іхняе скамяніў, каб ня ўбачылі вачыма і не зразумелі
сэрцам, і не навярнуліся, каб Я аздаравіў іх».
41 Гэта сказаў Ісая, калі бачыў славу Ягоную і гаварыў пра Яго.
42 Аднак і з начальнікаў шмат хто паверыў у Яго, але дзеля фарысэяў не прызнаваліся, каб іх
не адлучылі,
43 бо яны палюбілі больш славу чалавечую, чым славу Божую.
44 А Ісус закрычаў і сказаў: «Хто верыць у Мяне, не ў Мяне верыць, але ў Таго, Хто паслаў Мяне.
45 І хто бачыць Мяне, бачыць Таго, Хто паслаў Мяне.
46 Я, Сьвятло, прыйшоў у сьвет, каб кожны, хто верыць у Мяне, не застаўся ў цемры.
47 І калі хто пачуе гэтыя словы і не паверыць, Я ня буду судзіць яго, бо Я прыйшоў не каб судзіць
сьвет, але каб збавіць сьвет.
48 Хто адкідае Мяне і не прыймае словаў Маіх, мае судзьдзю для сябе — слова, якое Я сказаў,
яно будзе судзіць яго ў апошні дзень;
49 бо Я казаў не ад Сябе, але Айцец, Які паслаў Мяне, даў Мне прыказаньне, што казаць і што
гаварыць.
50 І Я ведаю, што прыказаньне Ягонае ёсьць жыцьцё вечнае. Дык тое, што Я гавару, гавару, як
сказаў Мне Айцец».

Ян 13

1 А перад сьвятам Пасхі Ісус, ведаючы, што прыйшла Яго гадзіна перайсьці з гэтага сьвету да
Айца, палюбіўшы Сваіх, якія ў гэтым сьвеце, да канца ўзьлюбіў іх.
2 І калі была вячэра і д'ябал улажыў ужо ў сэрца Юды Сымонавага Іскарыёта выдаць Яго,
3 Ісус, ведаючы, што Айцец усё аддаў у рукі Ягоныя і што Ён ад Бога выйшаў і да Бога ідзе,
4 устае ад вячэры, скідвае з Сябе адзеньне і, узяўшы ручнік, падперазаўся.
5 Потым налівае вады ва ўмывальніцу і пачынае абмываць ногі вучням і выціраць ручніком,
якім быў падперазаны.
6 Тады падыходзіць да Сымона Пятра, і той кажа Яму: «Госпадзе! Ці ж Табе абмываць ногі
гэтыя?»
7 Адказаў Ісус і сказаў яму: «Што Я раблю, ты цяпер ня ведаеш, але даведаешся пасьля».
8 Пётар кажа Яму: «Не абмыеш ног маіх да веку». Адказаў яму Ісус: «Калі не абмыю цябе, ня
будзеш мець часткі са Мною».
9 Кажа Яму Сымон Пётар: «Госпадзе, ня толькі ногі мае, але і рукі, і галаву».
10 Кажа яму Ісус: «Памытаму трэба толькі ногі абмыць, бо ён увесь чысты; і вы чыстыя, але ня
ўсе».
11 Бо ведаў, хто выдасьць Яго, таму сказаў: «Ня ўсе вы чыстыя».
12 Калі ж Ён абмыў ногі іхнія і ўзяў адзеньне Сваё, узьлёгшы ізноў, сказаў ім: «Ці разумееце,
што Я зрабіў вам?
13 Вы клічаце Мяне "Настаўнік" і "Госпад", і слушна кажаце, бо гэта Я і ёсьць.
14 Дык калі Я, Госпад і Настаўнік, абмыў вашыя ногі, дык і вы павінны абмываць ногі адзін
аднаму,
15 бо Я даў вам прыклад, каб, як Я зрабіў вам, і вы рабілі.
16 Сапраўды, сапраўды кажу вам: слуга ня большы за гаспадара свайго, і пасланец ня большы
за таго, хто яго паслаў.
17 Калі гэтае ведаеце, шчасьлівыя вы, калі гэта робіце.
18 Не пра ўсіх вас кажу. Я ведаю тых, каго выбраў, але каб споўнілася Пісаньне: "Той, хто есьць
са Мною хлеб, падняў на Мяне пяту сваю".
19 Цяпер кажу вам, раней, чым гэта сталася, каб, калі станецца, вы паверылі, што гэта Я ёсьць.
20 Сапраўды, сапраўды кажу вам: хто прыймае таго, каго Я паслаў, Мяне прыймае, а хто Мяне
прыймае, прыймае Таго, Хто паслаў Мяне».
21 Сказаўшы гэтае, Ісус усхваляваўся ў духу, і засьведчыў, і сказаў: «Сапраўды, сапраўды кажу
вам, што адзін з вас выдасьць Мяне!»

22 Тады вучні паглядалі адзін на аднаго, збянтэжаныя, пра каго Ён кажа.
23 Адзін з вучняў Ягоных, якога Ісус любіў, узьлягаў на ўлоньні Ісуса.
24 Яму дае знак Сымон Пётар, каб спытаўся, хто той, пра каго Ён кажа.
25 Той жа, прыхіліўшыся да грудзей Ісуса, кажа Яму: «Госпадзе! Хто гэта?»
26 Адказвае Ісус: «Гэта той, каму Я дам, абмачыўшы, лусту». І, абмачыўшы лусту, дае Юдзе Сымонаваму Іскарыёту.
27 І за лустаю ўвайшоў у яго шатан. Тады кажа яму Ісус: «Што робіш, рабі хутчэй».
28 Ніхто з тых, якія ўзьлягалі, таго не зразумеў, дзеля чаго Ён гэта сказаў яму.
29 А як у Юды была каліта, некаторыя думалі, што Ісус кажа яму: «Купі, што трэба нам на сьвята», ці каб даў нешта ўбогім.
30 Той жа, узяўшы лусту, адразу выйшаў; а была ноч.
31 Калі ён выйшаў, кажа Ісус: «Цяпер праслаўлены Сын Чалавечы, і Бог праслаўлены ў Ім.
32 Калі Бог праслаўлены ўІм, Бог праславіць Яго ў Сабе, і неўзабаве праславіць Яго.
33 Дзеткі, яшчэ трохі Я ёсьць з вамі. Будзеце шукаць Мяне і, як Я сказаў Юдэям: “Куды Я іду, вы ня можаце прыйсьці”, — так кажу цяпер і вам.
34 Новае прыказаньне даю вам, каб вы любілі адзін аднаго; як Я палюбіў вас, так і вы любіце адзін аднаго.
35 Па гэтым даведаюцца ўсе, што вы — Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго».
36 Кажа Яму Сымон Пётар: «Госпадзе, куды Ты ідзеш?» Адказаў яму Ісус: «Куды Я іду, ты ня можаш цяпер за Мною ісьці; але ўрэшце пойдзеш за Мною».
37 Кажа Яму Пётар: «Госпадзе! Чаму я не магу ісьці за Табою цяпер? Я душу маю палажу за Цябе».
38 Адказаў яму Ісус: «Душу сваю за Мяне паложыш? Сапраўды, сапраўды кажу табе: не прапяе певень, як тройчы адрачэшся ад Мяне.

Ян 14

1 Няхай не трывожыцца сэрца вашае. Верце ў Бога і верце ў Мяне.
2 У доме Айца Майго жытла шмат, бо калі б гэтак не было, Я сказаў бы вам, бо іду падрыхтаваць вам месца.
3 І, калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду ізноў, і вазьму вас да Сябе, каб і вы былі, дзе Я.
4 І куды Я іду, вы ведаеце, і шлях ведаеце».
5 Кажа Яму Тамаш: «Госпадзе! Ня ведаем, куды ідзеш, дык як можам ведаць шлях?»
6 Кажа яму Ісус: «Я ёсьць шлях, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, калі не праз Мяне.
7 Калі б вы пазналі Мяне, пазналі б і Айца Майго. І ад цяпер пазналі Яго і бачылі Яго».
8 Кажа яму Філіп: «Госпадзе! Пакажы нам Айца, і хопіць з нас».
9 Кажа яму Ісус: «Гэтулькі часу Я з вамі, і ты не пазнаў Мяне, Філіп? Хто бачыў Мяне, бачыў Айца; дык як ты кажаш: “Пакажы нам Айца”?
10 Ці ж ты ня верыш, што Я ў Айцу, і Айцец у-ва Мне? Словы, якія Я гавару вам, не гавару ад Сябе. Айцец, Які ў-ва Мне, Ён робіць гэтыя справы.
11 Верце Мне, што Я ў Айцу, і Айцец у-ва Мне; калі ж не, дзеля самых гэтых справаў верце Мне.
12 Сапраўды, сапраўды кажу вам: хто верыць у Мяне, будзе рабіць тыя справы, якія Я раблю, і большыя за іх зробіць, бо Я да Айца Майго іду.
13 І што папросіце ў імя Маё, тое зраблю, каб быў праслаўлены Айцец у Сыне.
14 Калі што папросіце ў імя Маё, Я зраблю.
15 Калі любіце Мяне, захоўвайце прыказаньні Мае.
16 І Я ўпрашу Айца, і Ён дасьць вам другога Абаронцу, каб заставаўся з вамі на вякі,
17 Духа праўды, Якога сьвет ня можа прыняць, бо ня бачыць Яго і не пазнаў Яго, а вы пазналі Яго, бо Ён з вамі застаецца і ў вас будзе.
18 Не пакіну вас сіротамі, прыйду да вас.
19 Яшчэ трохі, і сьвет ужо ня ўбачыць Мяне, а вы ўбачыце Мяне, бо Я жыву, і вы жыць будзеце.

20 У той дзень даведаецеся, што Я ў Айцу Маім, і вы ў-ва Мне, і Я ў вас.
21 Хто мае прыказаньні Мае і захоўвае іх, той любіць Мяне, а таго, хто любіць Мяне, будзе
любіць Айцец Мой, і Я палюблю яго, і зьяўлю яму Сябе».
22 Кажа Яму Юда, не Іскарыёт: «Госпадзе! Што сталася, што Ты маеш зьявіць Сябе нам, а ня
сьвету?»
23 Адказаў Ісус і сказаў яму: «Хто любіць Мяне, той захоўвае слова Маё; і Айцец Мой палюбіць
яго; і Мы прыйдзем да яго і зробім жытло ў яго.
24 Хто ня любіць Мяне, не захоўвае словаў Маіх, а слова, якое вы чуеце, ня ёсьць Маё, але Айца,
Які паслаў Мяне.
25 Гэтае сказаў Я вам, пакуль Я з вамі.
26 Абаронца ж, Дух Сьвяты, Якога пашле Айцец у імя Маё, навучыць вас усяго і нагадае вам усё,
што Я казаў вам.
27 Супакой пакідаю вам, супакой Мой даю вам; ня так, як сьвет дае, Я даю вам. Няхай не
трывожыцца сэрца вашае і не палохаецца.
28 Вы чулі, што Я сказаў вам: “Зыходжу і прыйду да вас”. Калі б вы любілі Мяне, то ўзрадаваліся
б, што Я сказаў: “Іду да Айца”, бо Айцец Мой большы за Мяне.
29 І цяпер Я сказаў вам, перш, чым сталася, каб, калі станецца, вы паверылі.
30 Ужо няшмат буду гаварыць з вамі, бо прыходзіць князь гэтага сьвету, і ў-ва Мне ня мае
нічога,
31 але, каб сьвет даведаўся, што Я люблю Айца і, як загадаў Мне Айцец, так і раблю. Устаньце,
пойдзем адгэтуль.

Ян 15

1 Я ёсьць сапраўдная вінаградная лаза, а Айцец Мой — вінаградар.
2 Усякую галіну ў Мяне, якая не дае плоду, Ён адсякае; і ўсякую, што дае плод, абчышчае, каб
больш пладоў давала.
3 Вы ўжо ачышчаныя праз слова, якое Я гаварыў вам.
4 Заставайцеся ў-ва Мне, і Я ў вас. Як галіна ня можа даваць плоду сама сабою, калі ня будзе
на лазе, так і вы, калі не застанецеся ў-ва Мне.
5 Я — вінаградная лаза, вы — галіны; хто застаецца ў-ва Мне, і Я ў ім, той прыносіць мноства
пладоў, бо без Мяне вы ня можаце рабіць нічога.
6 Хто ня будзе ў-ва Мне, будзе выкінуты вон, як галіна, і засохне; і іх зьбіраюць, і кідаюць у
вагонь, і яны згараць.
7 Калі застанецеся ў-ва Мне, і словы Мае ў вас застануцца, то што хочаце, прасіце, і станецца
вам.
8 У гэтым будзе праслаўлены Айцец Мой, калі вы прынесяцё мноства пладоў і будзеце Маімі
вучнямі.
9 Як палюбіў Мяне Айцец, і Я палюбіў вас; заставайцеся ў любові Маёй.
10 Калі захаваеце прыказаньні Мае, застанецеся ў любові Маёй, як і Я захаваў прыказаньні Айца
Майго і застаюся ў Яго любові.
11 Гэтае сказаў Я вам, каб радасьць Мая ў вас была, і каб радасьць вашая была поўная.
12 Гэта прыказаньне Маё, каб вы любілі адзін аднаго, як Я палюбіў вас.
13 Ніхто ня мае любові большае за тую, калі хто аддасьць душу сваю за сяброў сваіх.
14 Вы — сябры Мае, калі робіце тое, што Я загадваю вам.
15 Я больш не называю вас слугамі, бо слуга ня ведае, што робіць гаспадар ягоны, а Я назваў
вас сябрамі, бо ўсё, што чуў ад Айца Майго, паведаміў вам.
16 Ня вы Мяне выбралі, але Я вас выбраў і паставіў вас, каб вы ішлі і прыносілі плод, і каб плод
ваш заставаўся; каб тое, што папросіце ў Айца ў імя Маё, Ён даў вам.
17 Гэта загадваю вам, каб вы любілі адзін аднаго.
18 Калі сьвет вас ненавідзіць, зразумейце, што Мяне раней за вас зьненавідзіў.
19 Калі б вы былі са сьвету, сьвет любіў бы сваё, а як вы не са сьвету, але Я выбраў вас са сьвету,
дык за гэта ненавідзіць вас сьвет.

20 Памятайце словы, якія Я сказаў вам: “Слуга ня большы за гаспадара свайго”. Калі Мяне
перасьледавалі, і вас будуць перасьледаваць; калі Маё слова захавалі, і вашае захаваюць.
21 Але ўсё гэтае зробяць вам дзеля імя Майго, бо ня ведаюць Таго, Хто паслаў Мяне.
22 Калі б Я не прыйшоў і не гаварыў ім, ня мелі б грэху, а цяпер ня маюць адгаворкі ў грэху
сваім.
23 Хто Мяне ненавідзіць, ненавідзіць і Айца Майго.
24 Калі б Я не ўчыніў сярод іх справаў, якіх ніхто іншы не рабіў, ня мелі б грэху, а цяпер і бачылі,
і зьненавідзелі і Мяне, і Айца Майго.
25 Але каб споўнілася слова, напісанае ў Законе іхнім: “Зьненавідзелі Мяне дарэмна”.
26 Калі ж прыйдзе Абаронца, Якога Я пашлю вам ад Айца, Дух Праўды, Які ад Айца зыходзіць,
Ён будзе сьведчыць пра Мяне.
27 І вы таксама будзеце сьведчыць, бо вы ад пачатку са Мною.

Ян 16

1 Гэта сказаў Я вам, каб вы ня згоршыліся.
2 Будуць выключаць вас з сынагогаў; нават прыходзіць гадзіна, калі кожны, хто заб’е вас, будзе
думаць, што выконвае служэньне Богу.
3 І гэтак учыняць вам, бо не пазналі ані Айца, ані Мяне.
4 Але Я сказаў вам гэта, каб, калі прыйдзе тая гадзіна, вы памяталі, што Я сказаў вам; а не казаў
вам гэтага спачатку, бо быў з вамі.
5 Цяпер жа Я іду да Таго, Хто паслаў Мяне, і ніхто з вас не пытаецца ў Мяне: “Куды ідзеш?”
6 Але ад таго, што Я сказаў вам гэта, смутак напоўніў сэрца вашае.
7 Але Я праўду кажу вам: карысьней для вас, каб Я адыйшоў; бо калі Я не адыйду, Абаронца ня
прыйдзе да вас, а калі пайду, пашлю Яго да вас,
8 і Ён, прыйшоўшы, будзе дакараць сьвет у грэху, праведнасьці і судзе;
9 у грэху, што ня вераць у Мяне;
10 у праведнасьці, што Я да Айца Майго іду, і ўжо ня ўбачыце Мяне;
11 а ў судзе, што князь сьвету гэтага асуджаны.
12 Яшчэ шмат што маю сказаць вам, але вы цяпер ня можаце перанесьці.
13 Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, то будзе весьці вас да ўсякае праўды, бо не ад Сябе гаварыць
будзе, але будзе гаварыць тое, што пачуе, і абвесьціць вам, што мае прыйсьці.
14 Ён праславіць Мяне, бо з Майго возьме і вам абвесьціць.
15 Усё, што мае Айцец, ёсьць Маё; таму Я сказаў, што з Майго возьме і вам абвесьціць.
16 Крыху, і ня будзеце бачыць Мяне; і зноў крыху, і ўгледзіце Мяне, бо Я да Айца іду».
17 Тады гаварылі некаторыя з вучняў Ягоных паміж сабою: «Што гэта Ён кажа нам: “Крыху, і
ня будзеце бачыць Мяне, і зноў крыху, і ўгледзіце Мяне”, і: “Я да Айца іду”?»
18 Тады гаварылі: «Што гэта значыць, што Ён кажа: “Крыху”? Ня ведаем, што гаворыць».
19 Тады зразумеў Ісус, што хацелі спытацца ў Яго, і сказаў ім: «Ці пра тое пытаецеся адзін у
аднаго, што Я сказаў: “Крыху, і ня будзеце бачыць Мяне, і зноў крыху, і ўгледзіце Мяне”?
20 Сапраўды, сапраўды кажу вам: вы заплачаце і загалосіце, а сьвет узрадуецца; вы сумныя
будзеце, але смутак ваш радасьцю станецца.
21 Жанчына, калі нараджае, мае смутак, бо прыйшла яе гадзіна, але, калі народзіць дзіця, дык
ужо ня памятае пра гора ад радасьці, бо нарадзіўся чалавек у сьвет.
22 Так і вы цяпер маеце смутак, але Я ўбачу вас ізноў, і ўзрадуецца сэрца вашае, і радасьці
вашай ніхто не забярэ ў вас.
23 І ў той дзень ня будзеце пытацца ў Мяне ні пра што. Сапраўды, сапраўды кажу вам, калі пра
што папросіце Айца ў імя Маё, Ён дасьць вам.
24 Да сёньня вы нічога не прасілі ў імя Маё. Прасіце, і атрымаеце, каб радасьць вашая была
поўная.
25 Гэта ў прыказках гаварыў Я вам, але прыходзіць гадзіна, калі ўжо ня буду гаварыць у
прыказках, але адкрыта абвяшчу вам пра Айца.

26 У той дзень будзеце прасіць у імя Маё, і не кажу вам, што Я буду прасіць Айца за вас,
27 бо Сам Айцец сябруе з вамі, бо вы пасябравалі са Мною і паверылі, што Я ад Бога зыйшоў.
28 Я зыйшоў ад Айца і прыйшоў у сьвет, і зноў пакідаю сьвет і іду да Айца».
29 Кажуць Яму вучні Ягоныя: «Вось, Ты цяпер адкрыта гаворыш і прыказкі аніякай не кажаш.
30 Цяпер ведаем, што Ты ведаеш усё і ня маеш патрэбы, каб хто пытаўся ў Цябе. Дзеля гэтага верым, што Ты ад Бога зыйшоў».
31 Адказаў ім Ісус: «Цяпер верыце?
32 Вось, прыходзіць гадзіна, і ўжо прыйшла, калі вы расьсеецеся кожны ў свой бок і пакінеце Мяне аднаго. Але Я не адзін, бо Айцец са Мною.
33 Гэта сказаў Я вам, каб мелі супакой у-ва Мне. У гэтым сьвеце гора мець будзеце, але будзьце пэўныя, Я перамог сьвет».

Ян 17

1 Гэта сказаў Ісус, і падняў вочы Свае да неба, і прамовіў: «Ойча! Прыйшла гадзіна. Праслаў Сына Твайго, каб і Сын Твой праславіў Цябе,
2 бо Ты даў Яму ўладу над усякім целам, каб усяму, што Ты даў Яму, Ён даў жыцьцё вечнае.
3 А гэта ёсьць жыцьцё вечнае, каб пазналі Цябе, адзінага праўдзівага Бога, і Таго, Каго Ты паслаў, — Ісуса Хрыста.
4 Я праславіў Цябе на зямлі, скончыў справу, якую Ты даў Мне зрабіць.
5 Дык цяпер праслаў Мяне Ты, Ойча, у Цябе Самога той славаю, якую Я меў у Цябе раней, чым сьвет быў.
6 Я зьявіў імя Тваё людзям, якіх Ты Мне даў са сьвету. Яны былі Твае, і Ты іх даў Мне, і яны захавалі слова Тваё.
7 Цяпер яны пазналі, што ўсё, што Ты даў Мне, гэта ад Цябе.
8 Бо словы, якія Ты даў Мне, Я даў ім, і яны ўзялі і сапраўды зразумелі, што Я ад Цябе зыйшоў, і паверылі, што Ты Мяне паслаў.
9 Я за іх прашу, не за сьвет прашу, але за тых, якіх Ты даў Мне, бо яны Твае.
10 І ўсё Маё — Тваё, і Тваё — Маё; і ў іх Я ўславіўся.
11 І Я ўжо не ў сьвеце, але яны ў сьвеце, а Я да Цябе іду. Ойча сьвяты! Захавай іх у імя Тваё, тых, якіх Ты Мне даў, каб яны былі адно, як і Мы.
12 Калі Я быў з імі ў сьвеце, Я захоўваў іх у імя Тваё; тых, якіх Ты Мне даў, Я захаваў, і ніхто з іх не загінуў, акрамя сына загубы, каб споўнілася Пісаньне.
13 Цяпер жа Я да Цябе іду і гэта кажу ў сьвеце, каб яны мелі радасьць Маю ў сабе поўную.
14 Я даў ім слова Тваё, і сьвет зьненавідзеў іх, бо яны не са сьвету, як і Я не са сьвету.
15 Не прашу, каб Ты ўзяў іх са сьвету, але каб захаваў іх ад зла.
16 Яны не са сьвету, як і Я не са сьвету.
17 Асьвяці іх у праўдзе Тваёй! Слова Тваё — праўда.
18 Як Ты паслаў Мяне ў сьвет, так і Я паслаў іх у сьвет.
19 І за іх Я пасьвячаю Сябе, каб і яны былі асьвечаны ў праўдзе.
20 Не за іх жа толькі прашу, але і за тых, якія паверацъ у Мяне праз слова іх,
21 каб усе былі адно, як Ты, Айцец, у-ва Мне, і Я ў Табе, каб і яны былі ў Нас адно, каб паверыў сьвет, што Ты паслаў Мяне.
22 І славу, якую Ты даў Мне, Я даў ім, каб яны былі адно, як Мы адно.
23 Я ў іх, і Ты ў-ва Мне; каб былі злучаны ў адно, і каб пазнаў сьвет, што Ты паслаў Мяне і палюбіў іх, як палюбіў Мяне.
24 Ойча, тыя, якіх Ты даў Мне, хачу, каб і яны былі са Мною там, дзе Я, каб бачылі славу Маю, якую Ты даў Мне, бо Ты палюбіў Мяне раней заснаваньня сьвету.
25 Ойча праведны! І сьвет Цябе не пазнаў, але Я пазнаў Цябе, і яны пазналі, што Ты паслаў Мяне.
26 І Я паведаміў ім імя Тваё і паведамлю, каб любоў, якою Ты палюбіў Мяне, у іх была, і Я ў іх».

Ян 18

1 Сказаўшы гэта, Ісус выйшаў з вучнямі Сваімі за струмень Кедрон, дзе быў сад, у які ўвайшоў
Сам і вучні Ягоныя.
2 Ведаў жа гэтае месца і Юда, які выдаў Яго, бо Ісус там часта зьбіраўся з вучнямі Сваімі.
3 Дык Юда, узяўшы кагорту і паслугачоў ад першасьвятароў і фарысэяў, прыходзіць туды з
ліхтарамі, лямпамі і зброяй.
4 Ісус жа, ведаючы ўсё, што з Ім будзе, выйшаў і сказаў ім: «Каго шукаеце?»
5 Адказалі Яму: «Ісуса з Назарэту». Кажа ім Ісус: «Гэта Я». Стаяў жа з імі і Юда, які выдаў Яго.
6 Калі ж Ён сказаў ім: «Гэта Я», яны адступіліся назад і ўпалі на зямлю.
7 Тады ізноў спытаўся ў іх: «Каго шукаеце?» Яны сказалі: «Ісуса з Назарэту».
8 Адказаў Ісус: «Я сказаў вам, што гэта Я; калі ж Мяне шукаеце, дазвольце ім адыйсьці»,
9 каб споўнілася слова, якое Ён сказаў: «З тых, якіх Ты даў Мне, Я не загубіў нікога».
10 Сымон жа Пётар, маючы меч, выцягнуў яго і ўдарыў слугу першасьвятара, і адсек яму правае
вуха; а імя таго слугі было Малх.
11 Але Ісус сказаў Пятру: «Укладзі меч твой у похвы. Ці ж Я ня вып'ю келіха, які даў Мне
Айцец?»
12 Тады кагорта, і тысячнік, і паслугачы юдэйскія схапілі Ісуса і зьвязалі Яго,
13 і павялі Яго спачатку да Анны, бо ён быў цесьцем Каяфы, які быў у той год першасьвятаром.
14 Гэты Каяфа парадзіў Юдэям, што карысьней аднаму Чалавеку загінуць за народ.
15 А за Ісусам ішоў Сымон Пётар і іншы вучань. Вучань той быў знаёмы з першасьвятаром, і ён
увайшоў з Ісусам на панадворак першасьвятара.
16 А Пётар стаяў ля дзьвярэй звонку. Тады іншы вучань, які быў знаёмы з першасьвятаром,
пайшоў, і сказаў прыдзьверніцы, і ўвёў Пятра.
17 Тады кажа служка прыдзьверніца Пятру: «Ці і ты ня з вучняў Гэтага Чалавека?» Ён кажа:
«Не».
18 А слугі і паслугачы, распаліўшы вуглі, бо было сьцюдзёна, стаялі і грэліся. Пётар таксама
стаяў з імі і грэўся.
19 Першасьвятар жа спытаўся ў Ісуса пра вучняў Ягоных і пра вучэньне Ягонае.
20 Адказаў яму Ісус: «Я адкрыта гаварыў сьвету. Я заўсёды навучаў у сынагозе і ў сьвятыні, дзе
заўсёды зьбіраюцца Юдэі, і таемна не гаварыў нічога.
21 Чаму пытаешся ў Мяне? Папытайся ў тых, хто слухаў, што Я гаварыў ім. Вось, яны ведаюць,
што Я гаварыў».
22 Калі Ён сказаў гэта, адзін з паслугачоў, які стаяў побач, ударыў Ісуса па шчацэ, кажучы: «Так
Ты адказваеш першасьвятару?»
23 Адказаў яму Ісус: «Калі Я сказаў кепска, засьведчы, што кепска, а калі добра, за што б'еш
Мяне?»
24 Анна паслаў Яго зьвязанага да першасьвятара Каяфы.
25 А Сымон Пётар стаяў і грэўся. Тады сказалі яму: «Ці і ты ня з вучняў Ягоных?» Ён адрокся і
сказаў: «Не».
26 Кажа адзін са слугаў першасьвятара, сваяк таго, якому Пётар адсек вуха: «Ці ж ня бачыў я
цябе з Ім у садзе?»
27 Пётар ізноў адрокся; і адразу прапяяў певень.
28 Тады вядуць Ісуса ад Каяфы ў прэторыю. Была раніца, і яны не ўвайшлі ў прэторыю, каб не
занячысьціцца, але каб маглі есьці пасху.
29 Дык выйшаў да іх Пілат і сказаў: «Якое абвінавачваньне вы выстаўляеце адносна Чалавека
гэтага?»
30 Яны адказалі і сказалі яму: «Калі б Ён ня быў ліхадзеем, мы ня выдалі б Яго табе!»
31 Тады сказаў ім Пілат: «Вазьміце Яго вы і паводле вашага Закону судзіце Яго». Тады Юдэі
сказалі яму: «Нам нікога ня можна забіваць»,
32 каб споўнілася слова Ісуса, якое Ён сказаў, даючы знак, якою сьмерцю мае памерці.

33 Дык Пілат ізноў увайшоў у прэторыю, і паклікаў Ісуса, і сказаў Яму: «Ты — Валадар
Юдэйскі?»
34 Адказаў яму Ісус: «Ці ты ад сябе гаворыш гэта, ці іншыя сказалі табе пра Мяне?»
35 Пілат адказаў: «Ці ж я Юдэй? Твой народ і першасьвятары выдалі Цябе мне. Што Ты
ўчыніў?»
36 Адказаў Ісус: «Валадарства Маё ня з гэтага сьвету. Калі б з гэтага сьвету было Валадарства
Маё, паслугачы Мае змагаліся б, каб Я ня быў выдадзены Юдэям. Цяпер жа Валадарства Маё
ня згэтуль».
37 Тады сказаў Яму Пілат: «Дык Ты Валадар?» Адказаў Ісус: «Ты кажаш, што Я — Валадар. Я
на тое нарадзіўся і на тое прыйшоў у сьвет, каб сьведчыць пра праўду. Усякі, хто з праўды,
слухае голас Мой».
38 Кажа Яму Пілат: «Што ёсьць праўда?» І, сказаўшы гэта, ізноў выйшаў да Юдэяў і кажа ім:
«Я аніякае віны ў Ім не знаходжу.
39 Ёсьць жа ў вас звычай, каб я некага адпускаў вам на Пасху. Хочаце, адпушчу вам Валадара
Юдэйскага?»
40 Тады ізноў закрычалі ўсе, кажучы: «Не Яго, але Бараббу!» А Барабба быў разбойнік.

Ян 19

1 Тады Пілат узяў Ісуса і бічаваў.
2 І жаўнеры, сплёўшы вянок з церняў, усклалі Яму на галаву, і апранулі Яму пурпуровую шату,
3 і казалі: «Радуйся, Валадару Юдэйскі!», і білі Яго па шчаках.
4 Тады Пілат ізноў выйшаў навонкі і кажа ім: «Вось, я выводжу Яго навонкі да вас, каб вы
даведаліся, што я не знаходжу ў Ім аніякае віны».
5 Тады выйшаў навонкі Ісус у цярновым вянку і пурпуровай шаце. І кажа ім [Пілат]: «Вось
Чалавек!»
6 Калі ж убачылі Яго першасьвятары і паслугачы, дык закрычалі, кажучы: «Укрыжуй,
укрыжуй!» Кажа ім Пілат: «Вазьміце Яго вы і ўкрыжуйце, бо я не знайшоў ў Ім віны».
7 Адказалі яму Юдэі: «Мы маем Закон; і паводле Закону нашага Ён павінен памерці, бо зрабіў
Сябе Сынам Божым».
8 Калі Пілат пачуў гэта слова, яшчэ больш спалохаўся.
9 І ўвайшоў ён ізноў у прэторыю, і кажа Ісусу: «Адкуль Ты?» Ісус жа ня даў яму адказу.
10 Тады кажа Яму Пілат: «Ты не гаворыш са мною? Ці Ты ня ведаеш, што я маю ўладу
ўкрыжаваць Цябе і маю ўладу адпусьціць Цябе?»
11 Адказаў Ісус: «Ты ня меў бы аніякае ўлады нада Мною, калі б табе не было дадзена звыш;
дзеля гэтага большы грэх мае той, хто выдаў Мяне табе».
12 З таго моманту Пілат шукаў, каб адпусьціць Яго. А Юдэі закрычалі, кажучы: «Калі адпусьціш
Яго, ты ня сябра цэзару; усякі, хто робіць сябе валадаром, працівіцца цэзару».
13 Пілат, пачуўшы гэта слова, вывеў Ісуса на вонкі і сеў на судовым пасадзе, на месцы, якое
звалася Літастратан, а па-гебрайску — Габбата.
14 А быў дзень прыгатаваньня Пасхі, гадзіна каля шостай. І кажа ён Юдэям: «Вось, Валадар
ваш!»
15 Яны ж закрычалі: «Вазьмі, вазьмі, укрыжуй Яго!» Кажа ім Пілат: «Валадара вашага
ўкрыжую?» Адказалі першасьвятары: «Мы ня маем валадара, акрамя цэзара».
16 Тады ён выдаў ім Яго, каб быў укрыжаваны. Яны ўзялі Ісуса і павялі.
17 І, несучы крыж Свой, Ён выйшаў на месца, называнае Чараповае, якое па-гебрайску завецца
Галгофа.
18 Там укрыжавалі Яго, і з Ім двух другіх паабапал Яго, а ў сярэдзіне — Ісуса.
19 А Пілат напісаў надпіс і паставіў на крыжы. Было ж напісана: «Ісус з Назарэту, Валадар
Юдэйскі».
20 Гэты надпіс чыталі многія Юдэі, бо месца, дзе быў укрыжаваны Ісус, было недалёка ад
гораду, і напісана было па-гебрайску, па-грэцку і па-рымску.

21 Тады казалі Пілату першасьвятары юдэйскія: «Не пішы: “Валадар Юдэйскі”, але, што Ён Сам
сказаў: “Я — валадар юдэйскі”».
22 Адказаў Пілат: «Што я напісаў, тое напісаў».
23 А жаўнеры, калі ўкрыжавалі Ісуса, узялі адзеньне Ягонае і падзялілі на чатыры часткі —
кожнаму жаўнеру частка, і вопратку. А вопратка была ня шытая, але ўся вытканая ад верху.
24 Тады сказалі яны адзін аднаму: «Ня будзем разьдзіраць яе, але кінем жэрабя, чыёй яна
будзе», каб споўнілася Пісаньне, якое кажа: «Падзялілі адзеньне Маё між сабою і пра шату
Маю кідалі жэрабя». Так і ўчынілі жаўнеры.
25 А каля крыжа Ісуса стаялі маці Ягоная і сястра маці Ягонай Марыя Кляопава, і Марыя
Магдалена.
26 Ісус жа, убачыўшы маці і вучня, які стаяў побач і якога Ён любіў, кажа маці Сваёй:
«Жанчына! Вось сын твой!»
27 Потым кажа вучню: «Вось маці твая!» І з таго часу вучань узяў яе да сябе.
28 Пасьля гэтага Ісус, ведаючы, што ўсё ўжо зьдзейсьнілася, каб споўнілася Пісаньне, кажа:
«Смагну!»
29 Там стаяла пасудзіна, поўная воцату. [Жаўнеры], напоўніўшы губку воцатам і ўсклаўшы на
ізоп, паднесьлі да вуснаў Ягоных.
30 Калі ж Ісус узяў воцат, сказаў: «Зьдзейсьнілася!», і, схіліўшы галаву, аддаў дух.
31 А Юдэі, каб не засталіся целы на крыжы ў суботу, таму што быў дзень прыгатаваньня, а тая
субота была днём вялікім, прасілі Пілата, каб перабіць ў іх галёнкі і зьняць.
32 Тады прыйшлі жаўнеры, і ў першага перабілі галёнкі, і ў другога, які быў укрыжаваны з Ім.
33 Прыйшоўшы да Ісуса, калі ўбачылі, што Ён ужо памёршы, дык не перабілі ў Яго галёнак,
34 але адзін з жаўнераў дзідаю прабіў бок Ягоны, і адразу выцякла кроў і вада.
35 І той, хто бачыў, засьведчыў, і сьведчаньне ягонае праўдзівае; і ён ведае, што кажа праўду,
каб вы паверылі.
36 Бо гэта сталася, каб споўнілася Пісаньне: «Костка Ягоная ня будзе пераломленая».
37 І зноў іншае Пісаньне кажа: «Угледзяць, каго прабілі».
38 Пасьля гэтага Язэп з Арыматэі, які быў вучнем Ісуса, але патаемным дзеля страху перад
Юдэямі, папрасіў Пілата, каб узяць цела Ісуса; і Пілат дазволіў. Тады ён прыйшоў і ўзяў цела
Ісуса.
39 Прыйшоў і Нікадэм, які перш прыходзіў да Ісуса ўначы, несучы мешаніну сьмірны і алёэ
фунтаў каля ста.
40 Яны ўзялі цела Ісуса і абгарнулі Яго ў прасьціну з духмянасьцямі, як ёсьць звычай хаваць у
Юдэяў.
41 На тым месцы, дзе Ён быў укрыжаваны, быў сад, і ў тым садзе — новая магіла, у якой яшчэ
ніхто ня быў паложаны.
42 Там дзеля дня прыгатаваньня юдэйскага, бо магіла была блізка, палажылі Ісуса.

Ян 20

1 У першы ж дзень пасьля суботы Марыя Магдалена прыходзіць раніцаю, калі яшчэ было
цёмна, да магілы і бачыць, што камень адвалены ад магілы.
2 Тады бяжыць і прыходзіць да Сымона Пятра і другога вучня, з якім сябраваў Ісус, і кажа ім:
«Узялі Госпада з магілы, і ня ведаем, дзе палажылі Яго».
3 Тады выйшаў Пётар і другі вучань і прыйшлі да магілы.
4 Беглі ж абодва разам, і другі вучань бег хутчэй за Пятра, і прыйшоў першы да магілы,
5 і, нахіліўшыся, бачыць, што ляжыць прасьціна, але не ўвайшоў.
6 Тады прыходзіць Сымон Пётар, ідучы за ім, і ўваходзіць у магілу, і бачыць, што ляжыць
прасьціна
7 і хустка, што была на галаве Ягонай, ня разам з прасьціною, але асобна скручаная ў адным
месцы.
8 Тады ўвайшоў і другі вучань, які першы прыйшоў да магілы, і ўбачыў, і паверыў.

9 Бо яны яшчэ ня ведалі Пісаньня, што Ён мусіць уваскрэснуць з мёртвых.
10 Тады вучні ізноў адыйшлі да сябе.
11 А Марыя стаяла звонку каля магілы, плачучы. Калі ж яна плакала, нахілілася да магілы
12 і бачыць двух анёлаў у белым, што сядзелі адзін ля галавы і другі ля ног, дзе ляжала цела Ісуса.
13 І яны кажуць ёй: «Жанчына! Што ты плачаш?» Яна кажа: «Забралі Госпада майго, і ня ведаю, дзе палажылі Яго».
14 І, сказаўшы гэта, яна павярнулася назад, і бачыць, што стаіць Ісус, і яна ня ведала, што гэта Ісус.
15 Кажа ёй Ісус: «Жанчына! Што ты плачаш? Каго шукаеш?» Яна, думаючы, што гэта садоўнік, кажа Яму: «Пане! Калі Ты вынес Яго, скажы мне, дзе Ты Яго палажыў, і я вазьму Яго».
16 Кажа ёй Ісус: «Марыя!» Яна, павярнуўшыся, кажа Яму: «Раббуні!», — што значыць Настаўнік.
17 Кажа ёй Ісус: «Не дакранайся да Мяне, бо Я яшчэ не ўзыйшоў да Айца Майго, а ідзі да братоў Маіх і скажы ім: “Узыходжу да Айца Майго і Айца вашага, і да Бога Майго і Бога вашага”».
18 Марыя Магдалена прыходзіць, абвяшчаючы вучням, што бачыла Госпада і што Ён гэта сказаў ёй.
19 А ўвечары таго першага дня пасьля суботы, калі дзьверы там, дзе зьбіраліся вучні Ягоныя, былі замкнёныя дзеля страху перад Юдэямі, прыйшоў Ісус, і стаў пасярэдзіне, і кажа ім: «Супакой вам!»
20 І, сказаўшы гэта, паказаў ім рукі і бок Свой. Тады ўзрадаваліся вучні, убачыўшы Госпада.
21 Тады Ісус сказаў ім ізноў: «Супакой вам! Як паслаў Мяне Айцец, і Я пасылаю вас».
22 І, сказаўшы гэта, дыхнуў і кажа ім: «Прыйміце Духа Сьвятога.
23 Каму адпусьціце грахі, таму будуць адпушчаны, на кім затрымаеце, на тым будуць затрыманыя».
24 А Тамаш, адзін з Дванаццаці, называны Блізьнюк, ня быў з імі, калі прыходзіў Ісус.
25 Іншыя вучні тады сказалі яму: «Мы бачылі Госпада». А ён сказаў ім: «Калі ня ўбачу на руках Ягоных ранаў ад цьвікоў і ня ўткну пальца майго ў раны ад цьвікоў, і не ўлажу рукі маёй у бок Ягоны, не паверу».
26 І праз восем дзён ізноў былі ў доме вучні Ягоныя, і Тамаш з імі. Прыходзіць Ісус пры замкнёных дзьвярах, і стаў пасярэдзіне, і сказаў: «Супакой вам!»
27 Потым кажа да Тамаша: «Дай сюды палец твой і паглядзі рукі Мае; дай руку тваю і ўткні ў бок Мой; і ня будзь бязьверным, але верным».
28 І адказаў Тамаш, і сказаў Яму: «Госпад мой і Бог мой!»
29 Кажа яму Ісус: «Ты паверыў, Тамаш, таму што ўбачыў Мяне. Шчасьлівыя тыя, якія ня бачылі і паверылі».
30 Тады шмат іншых знакаў учыніў Ісус перад вучнямі Сваімі, пра якія не напісана ў гэтай кнізе.
31 А гэта напісана, каб вы паверылі, што Ісус ёсьць Хрыстос, Сын Божы, і каб, веручы, мелі жыцьцё ў імя Яго.

Ян 21

1 Пасьля гэтага ізноў зьявіўся Ісус вучням Сваім ля мора Тыбэрыядзкага. Зьявіўся Ён вось як:
2 былі разам Сымон Пётар і Тамаш, называны Блізьнюк, і Натанаэль з Каны Галілейскай, і сыны Заўдыя, і двое другіх з вучняў Ягоных.
3 Кажа ім Сымон Пётар: «Іду лавіць рыбу». Кажуць яму: «Пойдзем і мы з табою». Яны выйшлі і адразу ўвайшлі ў човен, і не злавілі ў тую ноч нічога.
4 Калі ўжо настала раніца, Ісус стаў на беразе, але вучні не пазналі, што гэта Ісус.
5 Кажа ім Ісус: «Дзеці! Ці маеце нейкі пасілак?» Яны адказалі Яму: «Не».
6 Ён жа сказаў ім: «Закіньце нерат на правы бок чаўна і зловіце». Тады яны закінулі, і ўжо не маглі яго выцягнуць дзеля мноства рыбы.

7 Тады той вучань, якога любіў Ісус, кажа Пятру: «Гэта Госпад». Сымон жа Пётар, пачуўшы,
што гэта Госпад, падперазаўся кашуляю, бо быў голы, і кінуўся ў мора.
8 А іншыя вучні прыплылі ў чаўне, бо не былі далёка ад зямлі, локцяў каля двухсот, цягнучы
нерат з рыбаю.
9 Калі ж выйшлі на зямлю, бачаць раскладзены агонь і рыбу, што ляжала на ім, і хлеб.
10 Кажа ім Ісус: «Прынясіце з тае рыбы, якую вы цяпер злавілі».
11 Сымон Пётар пайшоў і выцягнуў на зямлю нерат, поўны вялікіх рыбаў, якіх было сто
пяцьдзясят тры, і пры гэткай колькасьці нерат не падраўся.
12 Кажа ім Ісус: «Ідзіце, абедайце». З вучняў жа ніхто не адважыўся даведвацца ў Яго: «Хто
Ты?», бо ведалі, што гэта Госпад.
13 Прыходзіць тады Ісус, і бярэ хлеб, і дае ім; таксама і рыбу.
14 Гэта ўжо трэці раз зьявіўся Ісус вучням Сваім пасьля ўваскрасеньня з мёртвых.
15 Калі ж яны абедалі, Ісус кажа Сымону Пятру: «Сымон Ёнін, ці любіш ты Мяне больш, чым
гэтыя?» Той кажа Яму: «Так, Госпадзе! Ты ведаеш, што я сябрую з Табою». Ён кажа яму:
«Даглядай ягнятак Маіх».
16 Зноў кажа яму другі раз: «Сымон Ёнін, ці любіш ты Мяне?» Той кажа Яму: «Так, Госпадзе!
Ты ведаеш, што я сябрую з Табою». Ён кажа яму: «Пасьві авечак Маіх».
17 Кажа яму трэці раз: «Сымон Ёнін, ці сябруеш ты са Мною?» Засмуціўся Пётар, што трэці раз
спытаўся ў яго: «Ці сябруеш ты са Мною?», і сказаў Яму: «Госпадзе! Ты ўсё ведаеш, Ты ведаеш,
што я сябрую з Табою!» Кажа яму Ісус: «Даглядай авечак Маіх.
18 Сапраўды, сапраўды кажу табе: калі ты быў малады, дык падпаясваўся сам і хадзіў, куды
хацеў; а як састарэеш, выцягнеш рукі твае, і другі цябе падпаяша і павядзе, куды ня хочаш».
19 А гэта Ён сказаў, даючы знак, якою сьмерцю той праславіць Бога. І, сказаўшы гэтае, кажа
яму: «Ідзі за Мною».
20 Павярнуўшыся, Пётар бачыць, што ідзе за ім вучань, якога любіў Ісус і які на вячэры ўзьлёг
ля грудзей Ягоных, і сказаў: «Госпадзе! Хто той, які выдасьць Цябе?»
21 Убачыўшы яго, Пётар кажа Ісусу: «Госпадзе! А ён што?»
22 Кажа яму Ісус: «Калі Я хачу, каб ён застаўся, пакуль прыйду, што табе? Ты ідзі за Мною!»
23 Тады прайшло слова гэтае між братоў, што вучань той не памрэ. Але Ісус не сказаў яму, што
ён не памрэ, але: «Калі Я хачу, каб ён застаўся, пакуль прыйду, што табе?»
24 Гэты вучань і сьведчыць пра гэтае, і напісаў гэта. І мы ведаем, што праўдзівае сьведчаньне
ягонае.
25 Ёсьць таксама шмат іншага, што ўчыніў Ісус, але, каб напісаць гэта асобна, дык, я мяркую, і
самому сьвету не зьмясьціць напісаных кнігаў. Амэн.

ДЗЕІ АПОСТАЛАЎ

1 Першую аповесьць учыніў я, Тэафіле, пра ўсё, што пачаў Ісус рабіць і навучаць
2 да таго дня, у які быў узьнесены, даўшы праз Духа Сьвятога загады апосталам, якіх выбраў,
3 і перад якімі зьявіў Сябе жывым пасьля цярпеньняў Сваіх са шматлікімі доказамі, на працягу
сарака дзён паказываючыся ім і кажучы пра Валадарства Божае.
4 І, сабраўшы іх, загадаў ім: «Не адыходзьце з Ерусаліму, але чакайце на абяцаньне Айца, пра
якое вы чулі ад Мяне,
5 што Ян хрысьціў вадою, а вы праз некалькі дзён будзеце ахрышчаны Духам Сьвятым».
6 А яны, зыйшоўшыся, пыталіся ў Яго, кажучы: «Госпадзе, ці ня ў гэты час Ты адновіш
валадарства Ізраіля?»
7 Ён жа сказаў ім: «Ня вам ведаць час ці пару, якія Айцец паклаў ва ўладзе Сваёй,
8 але вы возьмеце сілу, як зыйдзе на вас Дух Сьвяты, і будзеце Мне сьведкамі ў Ерусаліме, і ў-ва
ўсёй Юдэі і Самарыі, і нават да краю зямлі».
9 І, сказаўшы гэтае, Ён быў падняты, калі яны глядзелі [на Яго], і воблака ўзяло Яго ад вачэй
іхніх.
10 І калі яны ўглядаліся ў неба, як Ён адыходзіў, вось, два мужы сталі перад імі ў белым
адзеньні
11 і сказалі: «Мужы Галілейскія! Чаго вы стаіцё, гледзячы ў неба? Гэты Ісус, узяты ад вас у
неба, прыйдзе гэтак сама, як вы бачылі Яго, што ідзе ў неба».
12 Тады яны вярнуліся ў Ерусалім з гары, называнай Аліўнай, што блізка ад Ерусаліму, за дзень
суботні ходу.
13 І, калі прыйшлі, узыйшлі ў залю, дзе былі Пётар, і Якуб, і Ян, і Андрэй, Філіп і Тамаш,
Барталамей і Мацьвей, Якуб Алфеяў і Сымон Зілот, і Юда Якубаў.
14 Усе яны трывалі аднадушна ў малітвах і просьбах разам з жанчынамі, і Марыяй, маці Ісуса,
і братамі Ягонымі.
15 І ў тыя дні Пётар, устаўшы сярод вучняў, сказаў, — а была грамада імёнаў разам каля ста
дваццаці:
16 «Мужы браты! Мусіла споўніцца тое Пісаньне, якое казаў раней Дух Сьвяты праз вусны
Давіда пра Юду, што стаўся павадыром тых, якія схапілі Ісуса,
17 што быў ён палічаны з намі, і выпала яму жэрабя служэньня гэтага.
18 Ён, што праўда, прыдбаў поле за нагароду няправеднасьці і, рынуўшыся, разьдзёрся
папалове, і вываліліся ўсе ўнутранасьці ягоныя,
19 і сталася гэта вядома ўсім, хто жыве ў Ерусаліме, так што поле тое названае на іхняй мове
Акельдама, гэта ёсьць Поле крыві.
20 Бо напісана ў кнізе Псальмаў: “Няхай станецца двор ягоны пустым, і няхай ніхто не жыве ў
ім”, і: “Урад ягоны няхай возьме іншы”.
21 Дык з тых мужоў, якія зыходзіліся з намі праз увесь час, калі прыходзіў і выходзіў да нас
Госпад Ісус,
22 пачынаючы ад хрышчэньня Янавага ажно да дня, калі Ён быў узяты ад нас, адзін з іх мусіць
стацца разам з намі сьведкам уваскрасеньня Яго».
23 І паставілі двух: Язэпа, называнага Барсабам, якога звалі Юстам, і Мацея,
24 і, молячыся, сказалі: «Ты, Госпадзе, Які ведаеш сэрцы ўсіх, пакажы з гэтых двух аднаго,
якога Ты выбраў
25 узяць жэрабя служэньня гэтага і апостальства, ад якога адступіўся Юда, каб ісьці на месца
сваё».
26 І кінулі жэрабя пра іх, і ўпала жэрабя на Мацея, і ён быў далучаны да адзінаццаці апосталаў.

Дз 2

1 І калі надыйшоў дзень Пяцідзясятніцы, былі ўсе аднадушна разам.

2 І стаўся раптам шум з неба, быццам ад наляцеўшага гвалтоўнага ветру, і напоўніў увесь дом,
дзе яны сядзелі.
3 І паказаліся ім падзеленыя языкі, быццам агнявыя, і паселі на кожным з іх.
4 І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі гаварыць іншымі мовамі, як Дух даваў ім
прамаўляць.
5 Былі ж у Ерусаліме спыніўшыся Юдэі, мужы пабожныя, з усякага народу пад небам.
6 А як стаўся голас гэты, зыйшлося мноства і ўстрывожылася, бо кожны чуў, што яны гавораць
ягонай мовай.
7 Усе ж дзівіліся і зьдзіўляліся, кажучы адзін аднаму: «Вось, усе гэтыя, што гавораць, ці ж не
Галілейцы?
8 І як мы чуем кожны сваю мову, у якой нарадзіліся?
9 Парты, і Мідзяне, і Эляміты, і жыхары Мэсапатаміі, Юдэі і Кападокіі, Понту і Азіі,
10 Фрыгіі і Памфіліі, Эгіпту і межаў Лібіі каля Кірэнэі, і прыйшоўшыя рымскія Юдэі, і празэліты,
11 Крыцяне і Арабы, — чуем іх, што гавораць нашымі мовамі пра веліч Божую?»
12 Дзівіліся ж усе і бянтэжыліся, кажучы адзін аднаму: «Што гэта можа быць?»
13 А іншыя, насьміхаючыся, казалі, што яны напіліся маладога віна.
14 Пётар жа з Адзінаццацьцю, устаўшы, узьняў голас свой і прамовіў да іх: «Мужы Юдэйскія і
ўсе жыхары Ерусаліму! Няхай будзе вам гэта вядома, і выслухайце словы мае,
15 бо яны ня п’яныя, як вы думаеце, бо яшчэ трэцяя гадзіна дня.
16 Але гэта ёсьць тое, што сказана праз прарока Ёэля:
17 “І будзе ў апошнія дні, — кажа Бог, — выльлю Духа Майго на ўсякае цела, і будуць прарочыць
сыны вашыя і дочкі вашыя; і юнакі вашыя будуць бачыць відзежы, і старыя вашыя будуць
сьніць сны.
18 І на слугаў Маіх і на служак Маіх выльлю ў тыя дні Духа Майго, і будуць прарочыць.
19 І дам цуды ў небе ўгары і знакі на зямлі ўнізе: кроў, і агонь, і куродым.
20 Сонца пераменіцца ў цемру, і месяц — у кроў перш, чым прыйдзе дзень Госпада, вялікі і
слаўны.
21 І будзе: кожны, хто будзе клікаць імя Госпада, будзе збаўлены”.
22 Мужы Ізраільцяне, выслухайце гэтыя словы: Ісуса з Назарэту, Мужа, зьяўленага між вамі
Богам моцамі, і цудамі, і знакамі, якія рабіў праз Яго Бог сярод вас, як і самі вы ведаеце,
23 Яго, паводле вызначанай рады і прадбачаньня Божага выдадзенага, вы, узяўшы і рукамі
беззаконьнікаў прыбіўшы цьвікамі, забілі.
24 Яго Бог уваскрасіў, вызваліўшы з мукаў сьмерці, таму што немагчыма было, каб Ён быў
стрыманы ёю.
25 Бо Давід кажа пра Яго: “Бачыў я Госпада перад сабою заўсёды, бо Ён праваруч мяне, каб я
не захістаўся.
26 Дзеля гэтага ўзьвесялілася сэрца маё, і ўзрадаваўся язык мой, нават і цела маё супачыне ў
надзеі,
27 бо Ты не пакінеш душу маю ў пекле і не дасі сьвятому Твайму ўбачыць парахненьне.
28 Ты даў мне ведаць шлях жыцьця; Ты напоўніш мяне радасьцю перад абліччам Тваім”.
29 Мужы браты! Належыцца мне сказаць вам адкрыта пра патрыярха Давіда, што ён і памёр, і
быў пахаваны, і магіла ягоная ў нас да гэтага дня.
30 А як быў ён прарок і ведаў, што прысягай прысягнуў яму Бог з плоду паясьніцы ягонай
паводле цела паставіць Хрыста і пасадзіць на пасадзе ягоным,
31 прадбачачы, ён гаварыў пра ўваскрасеньне Хрыста, што не пакінутая душа Ягоная ў пекле,
і цела Ягонае ня бачыла парахненьне.
32 Гэтага Ісуса ўваскрасіў Бог, і ўсе мы — сьведкі гэтага.
33 Дык узьнесены правіцаю Бога і ўзяўшы ад Айца абяцаньне Сьвятога Духа, Ён выліў тое, што
вы цяпер бачыце і чуеце.
34 Бо Давід не ўзыйшоў у неба, а ён кажа: “Сказаў Госпад Госпаду майму: "Сядзь праваруч
Мяне,

35 пакуль пакладу ворагаў Тваіх як падножжа ног Тваіх"".
36 Дык няхай упэўнена ведае ўвесь дом Ізраіля, што Бог зрабіў і Госпадам, і Хрыстом Яго, Гэтага
Ісуса, Якога вы ўкрыжавалі».
37 Пачуўшы гэта, яны былі ўражаныя ў сэрцы і сказалі да Пятра і рэшты апосталаў: «Што нам
рабіць, мужы браты?»
38 Пётар жа прамовіў да іх: «Навярніцеся, і няхай кожны з вас будзе ахрышчаны ў імя Ісуса
Хрыста дзеля адпушчэньня грахоў, і возьмеце дар Сьвятога Духа.
39 Бо абяцаньне для вас, і для дзяцей вашых, і для ўсіх, якія далёка, каго пакліча Госпад, Бог
наш».
40 І іншымі шматлікімі словамі сьведчыў і ўпрошваў, кажучы: «Ратуйцеся ад гэтага
пакаленьня скрыўленага».
41 Дык тыя, што прыхільна прынялі словы ягоныя, былі ахрышчаныя, і ў той дзень дадалося
каля трох тысячаў душ.
42 І трывалі яны ў вучэньні апосталаў, і ў супольнасьці, і ў ламаньні хлеба, і ў малітвах.
43 Быў жа страх на кожнай душы, і шмат цудаў і знакаў дзеялася праз апосталаў.
44 А ўсе, якія мелі веру, былі разам, і мелі ўсё супольнае.
45 І прадавалі маёмасьць і ўласнасьць, і дзялілі паміж усімі, хто якую меў патрэбу.
46 І кожны дзень аднадушна трываючы ў сьвятыні і ламаючы хлеб у дамах, прыймалі ежу ў
весялосьці і лагоднасьці сэрца,
47 хвалячы Бога і маючы ласку ва ўсяго народу. А Госпад штодня дадаваў да царквы тых, што
былі збаўленыя.

Дз 3

1 Пётар жа і Ян ішлі разам у сьвятыню а дзявятай гадзіне малітвы.
2 І нейкі чалавек, кульгавы ад чэрава маці сваёй, якога насілі і кожны дзень лажылі ля дзьвярэй
сьвятыні, называных Прыгожымі, прасіць міласьціну ў тых, якія ўваходзяць у сьвятыню,
3 убачыўшы Пятра і Яна, што меліся ўвайсьці ў сьвятыню, прасіў у іх міласьціны.
4 А Пётар, які з Янам углядаўся на яго, сказаў: «Паглядзі на нас».
5 Ён жа ўзіраўся на іх, чакаючы нешта ад іх узяць.
6 А Пётар сказаў: «Срэбра і золата няма ў мяне. А што маю, тое даю табе: у імя Ісуса Хрыста з
Назарэту ўстань і хадзі!»
7 І, узяўшы яго за правую руку, падняў. І адразу ўмацаваліся ногі і косткі ягоныя,
8 і ён, падскочыўшы, стаў, і хадзіў, і ўвайшоў з імі ў сьвятыню, ходзячы, і скачучы, і хвалячы
Бога.
9 І ўвесь народ бачыў яго, як хадзіў і хваліў Бога.
10 І пазналі яго, што ён быў той, які дзеля міласьціны сядзеў ля Прыгожых дзьвярэй сьвятыні;
і напоўніліся страхам і зьдзіўленьнем ад таго, што здарылася з ім.
11 А як аздароўлены кульгавы трымаўся Пятра і Яна, увесь народ у здуменьні прыбег да іх у
прысенак, называны Салямонавым.
12 Бачачы гэта, Пётар адказаў народу: «Мужы Ізраільцяне! Што зьдзіўляецеся гэтаму, ці што
так углядаецеся на нас, нібыта мы сваёю сілай або пабожнасьцю зрабілі, каб ён хадзіў?
13 Бог Абрагама, і Ісаака, і Якуба, Бог бацькоў нашых уславіў Сына Свайго Ісуса, Якога вы выдалі
і ад Якога адракліся перад абліччам Пілата, калі той судзіў вызваліць Яго.
14 Вы ж ад Сьвятога і Праведнага адракліся і прасілі дараваць вам чалавека забойцу,
15 а Самаго Начальніка жыцьця забілі. Яго Бог падняў з мёртвых, і мы — сьведкі гэтага.
16 І дзеля веры ў імя Ягонае ўмацавала імя Ягонае таго, каго вы бачыце і ведаеце; і вера, якая
ад Яго, дала яму ацаленьне гэтае перад усімі вамі.
17 І цяпер, браты, я ведаю, што праз няведаньне ўчынілі вы гэта, як і начальнікі вашыя,
18 а Сам Бог, Які прадвесьціў праз вусны ўсіх Сваіх прарокаў, каб цярпець [пакуты] Хрысту, тое
і споўніў.
19 Дык навярніцеся і вярніцеся, каб сьцерліся грахі вашыя,

20 каб прыйшлі часы асьвяжэньня ад аблічча Госпада, і каб Ён паслаў Ісуса Хрыста, Якога вам
наперад абвясьціў,
21 і Якога мусіла неба прыняць да часу напраўленьня ўсяго, пра што гаварыў Бог праз вусны
ўсіх Сваіх сьвятых прарокаў ад вякоў.
22 Бо Майсей сказаў бацькам: “Прарока паставіць вам Госпад, Бог ваш, з братоў вашых, як мяне.
Яго слухайце ў-ва ўсім, што будзе казаць вам.
23 І будзе: кожная душа, якая не паслухае Прарока гэтага, будзе вынішчана з народу”.
24 І ўсе прарокі ад Самуэля і па чарзе, якія толькі гаварылі, прапаведвалі гэтыя дні.
25 Вы — сыны прарокаў і запавету, які заключыў Бог з бацькамі нашымі, кажучы да Абрагама:
“І ў насеньні тваім дабраслаўлёныя будуць усе народы зямлі”.
26 Вам першым Бог, уваскрасіўшы Сына Свайго Ісуса, паслаў Яго, дабраслаўляючы вас, каб
адвярнуўся кожны ад зласьлівасьці сваёй».

Дз 4

1 Калі яны гаварылі да народу, сталі перад імі сьвятары, і начальнікі варты сьвятыні, і садукеі,
2 узлаваныя, што яны навучаюць народ і прапаведуюць у Ісусе ўваскрасеньне з мёртвых.
3 І ўсклалі на іх рукі, і аддалі іх у вастрог да заўтра, бо быў ужо вечар.
4 А многія з тых, якія чулі слова, паверылі; і быў лік такіх мужоў каля пяці тысячаў.
5 А назаўтра сталася, што сабраліся ў Ерусаліме начальнікі іхнія, і старшыні, і кніжнікі,
6 і Анна першасьвятар, і Каяфа, і Ян, і Аляксандар, і ўсе, хто быў з роду першасьвятарскага,
7 і, паставіўшы іх пасярод, пыталіся: «Якою моцаю ці якім імем вы ўчынілі гэта?»
8 Тады Пётар, напоўніўшыся Духам Сьвятым, сказаў да іх: «Начальнікі народу і старшыні
Ізраілю!
9 Калі нас сёньня дапытваюць за дабрадзейства нядужаму чалавеку, кім ён аздароўлены,
10 няхай будзе вядома ўсім вам і ўсяму народу Ізраіля, што ў імя Ісуса Хрыста з Назарэту, Якога
вы ўкрыжавалі, Якога Бог уваскрасіў з мёртвых, праз Яго ён стаіць перад вамі здаровы.
11 Ён — Камень, пагарджаны вамі, будаўнічымі, Які стаўся галавою вугла,
12 і ні ў кім іншым няма збаўленьня, бо няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, у якім
мусілі мы быць збаўленыя».
13 А ўбачыўшы адвагу Пятра і Яна і спасьцярогшы, што яны людзі няклніжныя і простыя,
зьдзіўляліся; пазналі ж іх, што яны былі з Ісусам.
14 Бачачы ж аздароўленага чалавека, які стаяў з імі, не маглі нічога запярэчыць.
15 Загадаўшы ж ім выйсьці з сынэдрыёну, радзіліся між сабою,
16 кажучы: «Што мы зробім з гэтымі людзьмі? Бо, праўда, вялікі знак, які стаўся праз іх, яўны
для ўсіх, хто жыве ў Ерусаліме, і мы ня можам адмовіць гэта.
17 Але, каб больш не разыходзілася гэта ў народзе, пагрозамі забаронім ім, каб ужо не гаварылі
ў імя гэтае нікому з людзей».
18 І, паклікаўшы іх, загадалі ім зусім не гаварыць і не навучаць у імя Ісуса.
19 А Пётар і Ян, адказваючы ім, сказалі: «Судзіце, ці справядліва перад Богам слухаць вас
больш, чым Бога?
20 Бо мы ня можам не гаварыць пра тое, што бачылі і чулі».
21 Яны ж, пагражаючы, вызвалілі іх, не знаходзячы, як пакараць іх, дзеля народу, бо ўсе славілі
Бога за тое, што сталася.
22 Бо больш за сорак гадоў было таму чалавеку, з якім стаўся знак аздараўленьня.
23 Калі ж іх вызвалілі, яны прыйшлі да сваіх і паведамілі ўсё, што ім сказалі першасьвятары і
старшыні.
24 А яны, пачуўшы, аднадушна паднялі голас да Бога і сказалі: «Уладару! Ты — Бог, Які ўчыніў
неба, і зямлю, і мора, і ўсё, што ў іх.
25 Праз вусны Давіда, слугі Твайго, Ты сказаў: “Чаму бунтуюцца пагане і народы задумваюць
марнае?
26 Паўсталі валадары зямлі, і князі сабраліся разам супраць Госпада і супраць Хрыста Ягонага”.

27 Бо праўдзіва сабраліся супраць Сьвятога Сына Твайго Ісуса, Якога Ты памазаў, Ірад і Понтый
Пілат з паганамі і народам Ізраіля,
28 каб учыніць усё, што рука Твая і рада Твая прадвызначылі, каб сталася.
29 І цяпер, Госпадзе, зірні на пагрозы іхнія, і дай слугам Тваім з усёю адвагаю гаварыць слова
Тваё,
30 а Ты працягні руку Тваю на аздараўленьне, і каб рабіліся знакі і цуды праз імя Сьвятога Сына
Твайго Ісуса».
31 І, як памаліліся, захісталася месца, дзе яны былі сабраўшыся, і ўсе былі напоўненыя Духам
Сьвятым, і гаварылі слова Божае з адвагаю.
32 А ў мноства тых, якія паверылі, было адно сэрца і адна душа, і ніхто нічога з маёмасьці сваёй
не называў сваім, але ўсё ў іх было супольнае.
33 І з вялікай сілай апосталы давалі сьведчаньне ўваскрасеньня Госпада Ісуса, і ласка вялікая
была на ўсіх іх.
34 Бо не было сярод іх нікога, хто меў нястачу, бо ўсе, хто меў палі ці дамы, продаючы іх,
прыносілі цану праданага
35 і клалі ля ног апосталаў; а кожнаму давалася тое, якую хто меў патрэбу.
36 А Ёсія, названы апосталамі Барнабам, што значыць Сын пацяшэньня, лявіт, родам з Кіпру,
37 які меў сваё поле, прадаўшы яго, прынёс грошы і паклаў ля ног апосталаў.

Дз 5

1 А нейкі муж, на імя Ананія, з Сапфіраю, жонкаю сваёю, прадаў маёмасьць сваю,
2 і прыхаваў з цаны з ведама жонкі сваёй, і, прынёсшы нейкую частку, палажыў ля ног
апосталаў.
3 А Пётар сказаў: «Чаму напоўніў шатан сэрца тваё, каб схлусіць Духу Сьвятому ды прыхаваць
з цаны за поле?
4 Ці ж не тваё было, што ты меў, і праданае ці ж не ў тваёй уладзе было? Навошта ты палажыў
рэч гэтую ў сэрца сваё? Ты схлусіў ня людзям, але Богу».
5 Пачуўшы словы гэтыя, Ананія ўпаў нежывы. І вялікі страх стаўся на ўсіх, якія чулі гэта.
6 А юнакі, устаўшы, узялі яго і, вынесшы, пахавалі.
7 Сталася ж гадзіны праз тры, прыйшла і жонка ягоная, ня ведаючы, што сталася.
8 А Пётар спытаўся ў яе: «Скажы мне, ці за гэтулькі аддалі вы поле?» Яна ж сказала: “Так, за
гэтулькі”.
9 А Пётар сказаў да яе: «Навошта змовіліся вы спакусіць Духа Госпадавага? Вось, пры дзьвярах
ногі тых, якія пахавалі мужа твайго, і яны вынясуць цябе».
10 Яна ж адразу ўпала ля ног ягоных нежывая. А юнакі, увайшоўшы, знайшлі яе мёртвую і,
вынесшы, пахавалі каля мужа яе.
11 І стаўся вялікі страх на ўсёй царкве і на ўсіх, якія чулі гэта.
12 А праз рукі апосталаў рабілася шмат знакаў і цудаў у народзе, і былі ўсе аднадушна ў
прысенку Салямонавым.
13 А з іншых ніхто не адважваўся прыстаць да іх, але ўзьвялічваў іх народ.
14 А тых, што вераць у Госпада, дадавалася яшчэ больш, мноства мужчынаў і жанчынаў,
15 так што выносілі хворых на вуліцы і лажылі на ложках і насілках, каб хоць цень Пятра, які
ішоў, ацяніў каго з іх.
16 Зыйшлося таксама ў Ерусалім мноства з навакольных гарадоў, несучы хворых і апанаваных
нячыстымі духамі, якія ўсе былі аздароўленыя.
17 А першасьвятар і ўсе, што з ім, якія былі з герэзіі садукейскай, паўстаўшы, напоўніліся
зайздрасьцю,
18 і ўсклалі рукі свае на апосталаў, і зьмясьцілі іх у вастрог грамадзкі.
19 А анёл Госпада ўначы адчыніў дзьверы вязьніцы і, вывеўшы іх, сказаў:
20 «Ідзіце і, стаўшы, гаварыце ў сьвятыні да народу ўсе словы жыцьця гэтага».

21 Пачуўшы гэта, яны ўвайшлі раніцаю ў сьвятыню і навучалі. А першасьвятар і тыя, што з ім,
прыйшоўшы, склікалі сынэдрыён і ўсю старшызну сыноў Ізраіля і паслалі ў вязьніцу прывесьці
іх.
22 Паслугачы ж, прыйшоўшы, не знайшлі іх у вязьніцы і, вярнуўшыся, паведамілі,
23 кажучы: «Вязьніцу знайшлі мы замкнёную надзейна і вартаўнікоў, якія звонку стаялі перад
дзьвярыма; але, адчыніўшы, усярэдзіне нікога не знайшлі».
24 Калі ж пачулі словы гэтыя сьвятар, і начальнік варты сьвятыні, і першасьвятары,
зьбянтэжыліся, што б гэта сталася?
25 А нехта, прыйшоўшы, паведаміў ім, кажучы, што вось мужы, якіх вы зьмясьцілі ў вязьніцу,
стаяць у сьвятыні і навучаюць народ.
26 Тады начальнік варты, пайшоўшы з паслугачамі, прывёў іх бяз гвалту, бо баяліся народу,
каб не ўкаменаваў іх.
27 А прывёўшы, паставілі іх у сынэдрыёне; і спытаўся ў іх першасьвятар,
28 кажучы: «Ці не пагрозамі забаранілі мы вам навучаць пра імя гэтае? І вось, вы напоўнілі
Ерусалім вучэньнем вашым і хочаце сьцягнуць на нас кроў Чалавека Гэтага».
29 І, адказваючы, Пётар і апосталы сказалі: «Больш трэба слухацца Бога, чым людзей.
30 Бог бацькоў нашых уваскрасіў Ісуса, Якога вы забілі, павесіўшы на дрэве.
31 Яго, Начальніка і Збаўцу, Бог правіцай Сваёй узвысіў, каб даць Ізраілю навяртаньне і
адпушчэньне грахоў.
32 І сьведкі Ягоныя на словы гэтыя — мы і Дух Сьвяты, Якога Бог даў тым, што слухаюцца Яго».
33 Тыя ж, пачуўшы, раз'юшыліся і пастанавілі пазабіваць іх.
34 А адзін фарысэй у сынэдрыёне, на імя Гамаліэль, законавучыцель, знаны ўсяму народу,
устаўшы, загадаў на трохі [часу] вывесьці апосталаў,
35 і сказаў ім: «Мужы Ізраільцяне, сьцеражыцеся адносна людзей гэтых, што маеце ўчыніць.
36 Бо перад гэтымі днямі паўстаў Тэўда, кажучы пра сябе як пра некага, і да яго прыстаў лік
мужоў каля чатырохсот; ён быў забіты, і ўсе, што слухаліся яго, расьцярушыліся і сталіся
нічым.
37 Пасьля гэтага ў дні перапісу паўстаў Юда Галілеец і пацягнуў за сабою даволі народу; і ён
загінуў, і ўсе, што слухаліся яго, рассыпаліся.
38 І цяпер кажу вам: адыйдзіцеся ад гэтых людзей і пакіньце іх; бо калі ад людзей рада гэтая
ці справа гэтая, будзе зьнішчаная,
39 а калі ад Бога, вы ня здолееце зьнішчыць яе, і каб не апынулася, што вы ваюеце з Богам».
40 Яны ж паслухаліся яго і, паклікаўшы апосталаў, зьбіўшы, загадалі ім не гаварыць пра імя
Ісуса, і вызвалілі іх.
41 Тыя ж пайшлі ад аблічча сынэдрыёна, радуючыся, што сталіся вартымі зьняважаньня за імя
Ягонае.
42 І кожны дзень у сьвятыні і дома не пераставалі навучаць і дабравесьціць пра Ісуса Хрыста.

Дз 6

1 А ў гэтыя дні, калі памножылася вучняў, сталася нараканьне Эліністаў на Гебраяў, што ў
штодзённым служэньні занядбоўваюцца ўдовы іхнія.
2 Дванаццаць жа, паклікаўшы мноства вучняў, сказалі: «Ня гожа нам, пакінуўшы слова Божае,
служыць пры сталах.
3 Дык нагледзьце спасярод вас, браты, сем засьведчаных мужоў, поўных Духа Сьвятога і
мудрасьці, якіх мы паставім на гэтую патрэбу,
4 а мы будзем трываць у малітве і служэньні слова».
5 І спадабалася слова гэтае перад абліччам усяго мноства, і выбралі Стэфана, мужа, поўнага
веры і Духа Сьвятога, і Філіпа, і Прохара, і Ніканора, і Тымона, і Пармэна, і Мікалая Антыяхійца,
празэліта.
6 Іх паставілі перад апосталамі; і яны, памаліўшыся, усклалі на іх рукі.
7 І слова Божае расло, і вучні ў Ерусаліме вельмі множыліся лікам, і вялікая колькасьць
сьвятароў паслухаліся веры.

8 А Стэфан, поўны веры і сілы, чыніў цуды і знакі вялікія ў народзе.
9 Паўсталі ж некаторыя з сынагогі, называнай Лібэртынскай, і Кірэнэйскай, і
Александрыйскай, і тых, што з Кілікіі і Азіі, спрачаючыся са Стэфанам,
10 і ня здолелі супрацьстаць мудрасьці і Духу, Якім ён гаварыў.
11 Тады падбілі мужоў сказаць: «Мы чулі яго, як гаварыў словы блюзьнерскія на Майсея і Бога».
12 І падбухторылі народ, і старшыняў, і кніжнікаў, і, стаўшы, схапілі яго, і прывялі ў
сынэдрыён.
13 І паставілі яны хлусьлівых сьведкаў, якія казалі: «Гэты чалавек не перастае гаварыць словы
блюзьнерскія супраць гэтага сьвятога месца і супраць Закону,
14 бо мы чулі, як ён казаў, што Ісус з Назарэту зруйнуе месца гэтае і зьменіць звычаі, якія
перадаў нам Майсей».
15 І ўсе тыя, што сядзелі ў сынэдрыёне, углядаючыся на яго, бачылі аблічча ягонае, нібыта
аблічча анёла.

Дз 7

1 А першасьвятар сказаў: «Ці ж гэта так?»
2 Той жа мовіў: «Мужы браты і бацькі, паслухайце! Бог славы зьявіўся бацьку нашаму
Абрагаму, калі той быў у Мэсапатаміі, перш, чым пасяліўся ў Харане,
3 і сказаў да яго: “Выйдзі з зямлі тваёй і ад родзічаў тваіх і ідзі ў зямлю, якую Я табе пакажу”.
4 Тады, выйшаўшы з зямлі Халдэйскае, ён пасяліўся ў Харане; адтуль пасьля сьмерці бацькі
ягонага [Бог] перасяліў яго ў гэтую зямлю, у якой вы цяпер жывяцё.
5 І ня даў яму ў ёй спадчыны ані на стапу нагі; і абяцаў яму даць яе ў валоданьне яму і насеньню
ягонаму пасьля яго, а ня меў ён дзіцяці.
6 Сказаў жа яму Бог, што насеньне ягонае будзе прыхаднем у зямлі чужой, і зьняволяць іх, і
будуць рабіць ім зло чатырыста гадоў.
7 “І народ, які зняволіць іх, Я буду судзіць, — сказаў Бог, — і пасьля гэтага яны выйдуць і будуць
служыць Мне ў гэтым месцы”.
8 І даў яму запавет абразаньня. І гэтак ён нарадзіў Ісаака, і абрэзаў яго на восьмы дзень; і Ісаак
— Якуба, і Якуб — дванаццаць патрыярхаў.
9 І патрыярхі, зайздросьцячы Язэпу, прадалі яго ў Эгіпет; і Бог быў з ім,
10 і выбавіў яго з усіх прыгнётаў ягоных, і даў яму ласку і мудрасьць перад фараонам,
валадаром Эгіпту; і той паставіў яго за кіраўніка над Эгіптам і над усім домам сваім.
11 Прыйшоў жа голад на ўсю зямлю Эгіпту і Ханаану, і гора вялікае, і бацькі нашыя не
знаходзілі жыўнасьці.
12 А Якуб, пачуўшы, што ёсьць збожжа ў Эгіпце, паслаў спачатку бацькоў нашых,
13 і за другім разам Язэп быў пазнаны братамі ягонымі, і фараону выявіўся род Язэпавы.
14 А Язэп, паслаўшы, паклікаў бацьку свайго Якуба і ўсіх родзічаў сваіх, душаў семдзесят пяць.
15 Якуб жа зыйшоў у Эгіпет, і памёр сам і бацькі нашыя,
16 і перанесьлі іх у Сыхем, і паклалі ў магілу, якую набыў Абрагам за цану срэбра ў сыноў
Гемора Сыхемава.
17 А як набліжаўся час абяцаньня, наконт якога прысягаў Бог Абрагаму, народ рос і
памнажаўся ў Эгіпце
18 да часу, калі паўстаў іншы валадар, які ня ведаў Язэпа.
19 Той, хітруючы супраць роду нашага, рабіў зло бацькам нашым, каб яны выкідалі немаўлят,
каб тыя не жылі.
20 У той час нарадзіўся Майсей, і быў мілы Богу; яго гадавалі тры месяцы ў доме бацькі ягонага.
21 Калі ж выкінулі яго, узяла яго дачка фараона і гадавала яго за сына сабе.
22 І быў настаўлены Майсей у-ва ўсёй мудрасьці Эгіпцянаў, і быў ён магутны ў словах і
ўчынках.
23 Калі ж споўнілася яму сорак гадоў веку, прыйшло яму на сэрца даведацца братоў сваіх,
сыноў Ізраіля.

24 І, убачыўшы, як некага крыўдзілі, заступіўся за яго і адпомсьціў за пакрыўджанага,
ударыўшы Эгіпцяніна.
25 Ён жа думаў, што браты ягоныя зразумеюць, што Бог рукой ягонай дае ім выбаўленьне, а
яны не зразумелі.
26 І на наступны дзень ён зьявіўся ім, як яны біліся, і вёў іх да згоды, кажучы: “Мужы, вы —
браты! Чаму вы крыўдзіце адзін аднаго?”
27 А той, што быў крыўдзіў бліжняга, адапхнуў яго, кажучы: “Хто паставіў цябе за начальніка
і судзьдзю над намі?
28 Ці ты хочаш забіць мяне, як забіў учора Эгіпцяніна?”
29 Праз гэтае слова ўцёк Майсей і стаўся прыхаднем у зямлі Мадыям, дзе нарадзіў двух сыноў.
30 А калі споўнілася сорак гадоў, зьявіўся яму ў пустыні пад гарою Сынай анёл Госпада ў
полымі агню ў кусьце.
31 Майсей жа, убачыўшы, зьдзівіўся відзежу, і калі ён набліжаўся, каб прыгледзецца, быў да
яго голас Госпада:
32 “Я — Бог бацькоў тваіх, Бог Абрагама, і Бог Ісаака, і Бог Якуба”. Трасучыся, Майсей не
адважыўся ўглядацца.
33 А Госпад сказаў яму: “Здымі сандалы з ног тваіх, бо месца, на якім ты стаіш, — зямля сьвятая.
34 Гледзячы, Я ўбачыў гора народу Майго ў Эгіпце, і пачуў стагнаньне іхнае, і зыйшоў выбавіць
іх. І цяпер ідзі, Я пашлю цябе ў Эгіпет”.
35 Таго Майсея, якога яны адракліся, кажучы: “Хто паставіў цябе за начальніка і судзьдзю?” —
яго Бог за начальніка і выбавіцеля паслаў рукой анёла, які зьявіўся яму ў кусьце.
36 Ён вывеў іх, учыніўшы цуды і знакі ў зямлі Эгіпецкай, і ў Чырвоным моры, і ў пустыні сорак
гадоў.
37 Гэта той Майсей, які сказаў сынам Ізраіля: “Прарока паставіць вам Госпад, Бог ваш, з братоў
вашых, як мяне; Яго слухайце”.
38 Гэта той, які быў у пустыні ў зборы з анёлам, што гаварыў на гары Сынай з ім і з бацькамі
нашымі, які прыняў словы жывыя, каб даць нам,
39 якому не хацелі быць паслухмяныя бацькі нашыя, але адапхнулі яго і павярнулі сэрцы свае
да Эгіпту,
40 кажучы Аарону: “Зрабі нам багоў, якія будуць ісьці наперадзе нас, бо ня ведаем, што сталася
з Майсеем гэтым, які вывеў нас з зямлі Эгіпецкай”.
41 І зрабілі ў тыя дні цяля, і прынесьлі ахвяру ідалу, і весяліліся ў справах рук сваіх.
42 А Бог адвярнуўся і аддаў іх служыць войску нябеснаму, як напісана ў кнізе Прарокаў: “Дом
Ізраіля, ці прыносілі вы Мне бітае і ахвяры сорак гадоў у пустыні?
43 І паднялі вы намёт Малоха і зорку бога вашага Рэмфана, абразы, якія вы зрабілі, каб ім
пакланяцца. І Я перасялю вас ажно за Бабілон”.
44 Намёт сьведчаньня быў у бацькоў нашых у пустыні, як загадаў Той, Які гаварыў Майсею
зрабіць яго паводле ўзору, які ён бачыў.
45 Яго, узяўшы, занесьлі бацькі нашыя з Егошуам у валоданьні паганаў, якіх Бог выгнаў ад
аблічча бацькоў нашых, ажно да дзён Давіда,
46 які знайшоў ласку перад Богам і прасіў, каб знайсьці будыніну Богу Якуба.
47 Салямон жа пабудаваў Яму дом.
48 Але Найвышэйшы не жыве ў бажніцах, зробленых рукамі, як кажа прарок:
49 “Неба — пасад Мой, а зямля — падножжа ног Маіх. Які ж дом вы пабудуеце Мне, — кажа
Госпад, — або якое месца супачынку Майго?
50 Ці ж не Мая рука ўчыніла ўсё гэтае?”
51 [Людзі] з цьвёрдым каркам і з неабрэзаным сэрцам і вушамі! Вы заўсёды супрацівіцеся Духу
Сьвятому, як бацькі вашыя, так і вы.
52 Каго з прарокаў не перасьледавалі бацькі вашыя, і пазабівалі прадвесьнікаў прыходу
Праведніка, здраднікамі і забойцамі Якога вы цяпер сталіся,
53 вы, якія ўзялі Закон паводле пастановы анёлаў і не захавалі яго».

54 А слухаючы гэта, яны раз'юшваліся ў сэрцах сваіх і скрыгаталі зубамі на яго.
55 Ён жа, напоўнены Духам Сьвятым, углядаючыся ў неба, убачыў славу Божую і Ісуса, Які
стаіць праваруч Бога,
56 і сказаў: «Вось, бачу неба адчыненае і Сына Чалавечага, Які стаіць праваруч Бога».
57 Яны ж, закрычаўшы моцным голасам, пазатыкалі вушы свае, і аднадушна рынуліся на яго,
58 і, выгнаўшы за горад, каменавалі яго. І сьведкі кінулі адзеньні свае ля ног дзяцюка,
называнага Саўл,
59 і каменавалі Стэфана, які клікаў [Бога] і казаў: «Госпадзе Ісусе, прыймі дух мой!»
60 І, укленчыўшы, закрычаў моцным голасам: «Госпадзе, не палічы ім грэху гэтага!» І,
сказаўшы гэта, памёр.

Дз 8

1 А Саўл згаджаўся на забойства яго. Сталася ж у той дзень вялікае перасьледваньне царквы ў
Ерусаліме. І ўсе, акрамя апосталаў, былі расьцярушаныя па ваколіцах Юдэі і Самарыі.
2 А Стэфана пахавалі мужы пабожныя і ўчынілі па ім галашэньне вялікае.
3 Саўл жа нішчыў царкву, уваходзячы ў дамы, і, цягнучы мужчынаў і жанчынаў, аддаваў [іх] у
вязьніцу.
4 А тыя, што расьцярушыліся, хадзілі, дабравесьцячы слова.
5 Філіп жа, зыйшоўшы ў горад Самаранскі, абвяшчаў ім Хрыста.
6 І натоўпы прыслухоўваліся да ўсяго, што казаў Філіп, аднадушна слухаючы і бачачы знакі,
якія ён чыніў.
7 Бо з многіх, якія мелі духаў нячыстых, яны выходзілі, крычучы моцным голасам, а шмат
спараліжаваных і кульгавых былі аздароўленыя.
8 І сталася радасьць вялікая ў горадзе тым.
9 А быў раней у гэтым горадзе нейкі муж на імя Сымон, які чараваў і зьдзіўляў народ Самарыі,
называючы сябе некім вялікім.
10 І прыслухоўваліся да яго ўсе ад малога да вялікага, кажучы: «Ён ёсьць вялікая моц Божая».
11 Прыслухоўваліся ж да яго дзеля таго, што ён даволі часу чараваньнем зьдзіўляў іх.
12 А калі паверылі Філіпу, які дабравесьціў пра Валадарства Божае і імя Ісуса Хрыста, былі
ахрышчаны як мужчыны, так і жанчыны.
13 Дый Сымон і той паверыў, і, ахрысьціўшыся, трываў пры Філіпе. А бачачы знакі і цуды
вялікія, што рабіліся, дзівіўся.
14 Апосталы ж, што былі ў Ерусаліме, пачуўшы, што Самарыя прыняла слова Божае, паслалі
да іх Пятра і Яна,
15 якія, прыйшоўшы, памаліліся за іх, каб атрымалі Духа Сьвятога,
16 бо Ён ня быў на нікога з іх зыйшоўшы, а толькі былі яны ахрышчаны ў імя Госпада Ісуса.
17 Тады яны ўсклалі на іх рукі, і яны атрымалі Духа Сьвятога.
18 Сымон жа, пабачыўшы, што праз ускладаньне рук апосталаў даецца Дух Сьвяты, прынёс ім
грошы,
19 кажучы: «Дайце і мне гэткую ўладу, каб той, на каго ўскладу рукі, атрымаў Духа Сьвятога».
20 Пётар жа сказаў яму: «Няхай срэбра тваё будзе з табой на загубу, бо дар Божы ты думаў за
грошы здабыць.
21 Няма табе часткі і жэрабя ў слове гэтым, бо сэрца тваё ня шчырае перад Богам.
22 Дык навярніся ад гэтай ліхоты тваёй і прасі Бога, можа, будзе адпушчана табе задума сэрца
твайго.
23 Бо бачу цябе ў гарчыні жоўці і ў вузьле няправеднасьці».
24 А Сымон, адказваючы, сказаў: «Маліцеся вы за мяне да Госпада, каб не прыйшло на мяне
тое, што вы сказалі».
25 Яны ж, засьведчыўшы і расказаўшы слова Госпада, вярнуліся ў Ерусалім, дабравесьцячы ў
многіх мястэчках Самаранскіх.
26 А анёл Госпада прамовіў да Філіпа, кажучы: «Устань і ідзі на поўдзень, на шлях, які
зыходзіць з Ерусаліму ў Газу, той, які пусты».

27 І, устаўшы, ён пайшоў. І вось, муж Этыёпскі, эўнух, можны Кандакіі, валадаркі Этыёпаў, які
быў над усімі скарбамі ейнымі і прыйшоў у Ерусалім пакланіцца,
28 вяртаўся назад, і сядзеў у калясьніцы сваёй, і чытаў прарока Ісаю.
29 А Дух сказаў Філіпу: «Падыйдзі і прыстань да калясьніцы гэтай».
30 Прыбегшы, Філіп пачуў, што той чытае прарока Ісаю, і сказаў: «Ці разумееш тое, што
чытаеш?»
31 Той жа сказаў: «Як жа я магу, калі нехта не растлумачыць мне?» І папрасіў Філіпа,
узыйшоўшы, сесьці з ім.
32 А ўрывак Пісаньня, які ён чытаў, быў гэткі: «Як авечку на зарэз, вялі Яго; і як ягня безгалосае
перад тым, хто стрыжэ, гэтак Ён не адчыняе вуснаў Сваіх.
33 У паніжэньні Ягоным суд Ягоны ўзяты. А паходжаньне Ягонае хто распавядзе? Бо жыцьцё
Ягонае будзе ўзята ад зямлі».
34 Адказваючы, эўнух сказаў Філіпу: «Прашу цябе, пра каго прарок гаворыць гэтае? Пра самога
сябе ці пра каго іншага?»
35 А Філіп, адчыніўшы вусны свае і пачаўшы ад Пісаньня гэтага, дабравесьціў яму Ісуса.
36 А як ехалі па дарозе, прыйшлі да вады; і кажа эўнух: «Вось вада. Што перашкаджае мне быць
ахрышчаным?»
37 А Філіп сказаў: «Калі верыш з усяго сэрца, можна». Ён жа, адказваючы, сказаў: «Веру, што
Ісус Хрыстос ёсьць Сын Божы».
38 І загадаў спыніць калясьніцу. І зыйшлі абодва ў ваду, як Філіп, так і эўнух, і ахрысьціў яго.
39 Калі ж выйшлі яны з вады, Дух Госпада падхапіў Філіпа, і эўнух больш ня бачыў яго, бо
паехаў у сваю дарогу, радуючыся.
40 А Філіп апынуўся ў Азоце; і, праходзячы, дабравесьціў па ўсіх гарадах, пакуль прыйшоў у
Цэзарэю.

Дз 9

1 Саўл жа, яшчэ дыхаючы пагрозай і забойствам на вучняў Госпадавых, падыйшоў да
першасьвятара
2 і прасіў у яго лісты ў Дамаск да сынагогаў, каб, калі знойдзе некага, хто ёсьць на гэтым шляху,
як мужчынаў, так і жанчынаў, зьвязаўшы, весьці ў Ерусалім.
3 А калі ён ішоў, сталася, як ён наблізіўся да Дамаску, што неспадзявана агарнула яго сьвятло
з неба.
4 І, упаўшы на зямлю, ён пачуў голас, які гаварыў яму: «Саўле, Саўле, чаму ты перасьледуеш
Мяне?»
5 Ён жа сказаў: «Хто Ты, Госпадзе?» А Госпад сказаў: «Я — Ісус, Якога ты перасьледуеш. Цяжка
табе супраць ражна ўпірацца».
6 І ён, дрыжучы і жахаючыся, сказаў: «Госпадзе, што хочаш, каб я рабіў?» І Госпад [кажа] да
яго: «Устань і ідзі ў горад, і будзе табе сказана, што ты мусіш рабіць».
7 А мужы, якія спадарожнічалі яму, стаялі аслупянеўшы, чуючы голас, а нікога ня бачачы.
8 Саўл жа ўстаў з зямлі, і, адчыніўшы вочы свае, нікога ня бачыў; і ўзяўшы за руку, увялі яго ў
Дамаск.
9 І тры дні ён ня бачыў, і ня еў, і ня піў.
10 Быў жа ў Дамаску адзін вучань на імя Ананія. І сказаў да яго Госпад у відзежы: «Ананія!»
Ён жа сказаў: «Вось я, Госпадзе!»
11 А Госпад да яго: «Устаўшы, ідзі на вуліцу, называную Простай, і ў доме Юды пашукай
Тарсяніна на імя Саўл, бо вось, ён моліцца
12 і бачыў у відзежы мужа на імя Ананія, які ўвайшоў і ўсклаў на яго руку, каб ён зноў бачыў».
13 Ананія ж адказаў: «Госпадзе, я чуў ад многіх пра мужа гэтага, колькі ліха ўчыніў ён сьвятым
Тваім у Ерусаліме;
14 і тут ён мае ўладу ад першасьвятароў зьвязваць усіх, хто прызывае імя Тваё».
15 А Госпад сказаў да яго: «Ідзі, бо ён — Мая выбраная пасудзіна, каб несьці імя Маё перад
паганамі, і валадарамі, і сынамі Ізраіля,

16 бо Я пакажу яму, колькі ён мусіць перацярпець за імя Маё».
17 Ананія пайшоў, і ўвайшоў у той дом, і, усклаўшы на яго рукі, сказаў: «Саўле, браце, Госпад
паслаў мяне, Ісус, Які зьявіўся табе на дарозе, па якой ты ішоў, каб ты зноў бачыў і напоўніўся
Духам Сьвятым».
18 І адразу нібы луска апала з вачэй ягоных, і стаў бачыць у той жа момант, і, устаўшы, быў
ахрышчаны,
19 і, прыняўшы ежу, умацаваўся. І быў Саўл колькі дзён з вучнямі, што ў Дамаску,
20 і адразу абвяшчаў у сынагогах Хрыста, што Ён ёсьць Сын Божы.
21 А ўсе, хто чуў, дзівіліся і казалі: «Ці ня гэта той самы, які нішчыў у Ерусаліме тых, хто
прызывае імя гэтае, і сюды прыйшоў дзеля таго, каб іх, зьвязаўшы, весьці да першасьвятароў?»
22 А Саўл больш умацоўваўся і трывожыў Юдэяў, якія жылі ў Дамаску, даводзячы, што Гэты
[Ісус] ёсьць Хрыстос.
23 Калі ж споўнілася даволі дзён, Юдэі зрабілі нараду, каб забіць яго.
24 А Саўл даведаўся пра змову іхнюю. І яны сачылі ля брамаў дзень і ноч, каб яго забіць.
25 А вучні, узяўшы яго, уначы спусьцілі праз мур у кашы.
26 Прыйшоўшы ж у Ерусалім, Саўл спрабаваў прыстаць да вучняў, і ўсе баяліся яго, ня верачы,
што ён — вучань.
27 А Барнаба, узяўшы яго, прывёў да апосталаў і распавёў ім, як у дарозе той бачыў Госпада, і
што Ён гаварыў яму, і як ён у Дамаску адважна гаварыў у імя Ісуса.
28 І быў ён разам з імі, уваходзячы і выходзячы ў Ерусалім, і адважна гаворачы ў імя Госпада
Ісуса.
29 Гаварыў таксама і спрачаўся з эліністамі, а тыя намагаліся яго забіць.
30 Браты ж, даведаўшыся, вывелі яго ў Цэзарэю і выправілі яго ў Тарс.
31 А цэрквы па ўсёй Юдэі, і Галілеі, і Самарыі мелі супакой, будуючыся і ходзячы ў страху
Госпадавым, і праз пацяшэньне Духа Сьвятога памнажаліся.
32 Сталася ж, што Пётар, абыходзячы ўсіх, прыйшоў і да сьвятых, што жылі ў Лідзьдзе.
33 Знайшоў жа ён там аднаго чалавека, на імя Энэй, які восем гадоў ляжаў у ложку, бо быў
спараліжаваны.
34 І сказаў яму Пётар: «Энэй, цябе аздараўляе Ісус Хрыстос; устань і пасьцялі сабе». І ён адразу
ўстаў.
35 І бачылі яго ўсе, што жылі ў Лідзьдзе і Сароне, якія зьвярнуліся да Госпада.
36 А ў Ёппе была адна вучаніца, на імя Табіта, што ў перакладзе азначае Сарна. Яна была поўная
добрых учынкаў і міласьцінаў, якія рабіла.
37 Сталася ж у тыя дні, што, занядужаўшы, яна памерла. Яе памылі і палажылі ў залі.
38 А як Лідда была блізка ад Ёппы, дык вучні, пачуўшы, што там Пётар, паслалі двух мужоў да
яго, просячы прыйсьці да іх не марудзячы.
39 Устаўшы, Пётар прыйшоў да іх, і, як прыйшоў, завялі яго ў залю; і сталі перад ім усе ўдовы,
галосячы і паказваючы вопраткі і адзеньне, якія паспраўляла Сарна, як была з імі.
40 А Пётар, выслаўшы ўсіх вонкі, укленчыўшы, маліўся і, зьвярнуўшыся да цела, сказаў:
«Табіта, устань!» Яна ж адчыніла вочы свае і, убачыўшы Пятра, села.
41 А ён, даўшы ёй руку, падняў яе і, клікнуўшы сьвятых і ўдоваў, паставіў яе перад імі жывую.
42 І сталася ведама па ўсёй Ёппе, і многія паверылі ў Госпада.
43 Сталася ж, што ён даволі дзён заставаўся ў нейкага Сымона гарбара.

Дз 10

1 А ў Цэзарэі быў адзін муж, на імя Карнэль, сотнік кагорты, называнай Італійскай,
2 пабожны і багабойны з усім домам сваім. Ён чыніў шмат міласьцінаў народу і ўсьцяж маліўся
Богу.
3 Ён бачыў яўна ў відзежы каля дзявятае гадзіны дня анёла Божага, які ўвайшоў да яго і сказаў
яму: «Карнэль!»

4 Ён жа, углядаючыся на яго і будучы ў страху, сказаў: «Што, Госпадзе?» А той сказаў яму:
«Малітвы твае і міласьціны твае ўзыйшлі на памяць перад Богам.
5 І цяпер пашлі ў Ёппу мужоў, і пакліч Сымона, які называецца Пятром;
6 ён гасьцюе ў нейкага Сымона гарбара, дом якога ля мора. Ён скажа табе, што ты мусіш
рабіць».
7 Калі ж анёл, які гаварыў з Карнэлем, адыйшоў, ён, паклікаўшы двух слугаў сваіх і пабожнага
жаўнера з тых, што былі пры ім,
8 і ўсё ім распавёўшы, паслаў іх у Ёппу.
9 А на наступны дзень, як яны былі ў дарозе і набліжаліся да гораду, Пётар узыйшоў на дах
памаліцца каля шостае гадзіны.
10 Адчуў жа голад і захацеў есьці; а калі гатавалі, ахапіла яго захапленьне,
11 і бачыць ён неба расчыненае і начыньне нейкае, якое зыходзіла да яго, быццам вялікі абрус,
зьвязаны за чатыры канцы і апусканы на зямлю.
12 У ім былі ўсе чатырохногія зямныя, і зьвяры, і паўзуны, і птушкі нябесныя.
13 І стаўся голас да яго: «Устаўшы, Пётар, заколвай і еш».
14 А Пётар сказаў: «Ніякім чынам, Госпадзе, бо ніколі ня еў я паганага ці нячыстага».
15 І голас ізноў другі раз да яго: «Што Бог ачысьціў, ты не пагань».
16 Сталася ж гэта тройчы, і начыньне ізноў узьнялося ў неба.
17 Калі ж Пётар бянтэжыўся ў сабе, што б значыў відзеж, які бачыў, вось, мужы, пасланыя ад
Карнэля, распытаўшы пра дом Сымона, спыніліся ля брамы
18 і, крыкнуўшы, спыталіся, ці тут гасьцюе Сымон, называны Пятром.
19 А як Пётар думаў пра гэты відзеж, сказаў яму Дух: «Вось, тры мужы шукаюць цябе.
20 Дык, устаўшы, зыйдзі і ідзі з імі, нічога не сумняваючыся, бо Я паслаў іх».
21 Зыйшоўшы ж да тых мужоў, пасланых да яго ад Карнэля, Пётар сказаў: «Вось, я той, каго
вы шукаеце. Што за прычына, дзеля якой вы прыйшлі?»
22 Яны ж сказалі: «Карнэль, сотнік, муж праведны і багабойны, пра якога сьведчыць увесь
народ Юдэйскі, атрымаў загад ад сьвятога анёла паклікаць цябе ў дом свой і паслухаць словы
ад цябе».
23 Тады Пётар, запрасіўшы, гасьцяваў іх, а на заўтра пайшоў з імі, і некаторыя з братоў, якія з
Ёппы, пайшлі з ім.
24 І на наступны дзень прыйшлі яны ў Цэзарэю, а Карнэль чакаў на іх, склікаўшы сваякоў сваіх
і блізкіх сяброў.
25 Калі ж сталася, што Пётар увайшоў, Карнэль, сустрэўшы яго, упаў да ног ягоных і
пакланіўся.
26 А Пётар падняў яго, кажучы: «Устань, і я таксама чалавек».
27 І, размаўляючы з ім, увайшоў, і знаходзіць шмат сабраных.
28 І прамовіў да іх: «Вы ведаеце, што не належыцца мужу Юдэйскаму злучацца ці зыходзіцца
з чужынцамі, але Бог паказаў мне не называць ніякага чалавека паганым ці нячыстым.
29 Дзеля гэтага я і прыйшоў, як быў пакліканы, без пярэчаньняў. Дык пытаюся: дзеля якой
прычыны вы паклікалі мяне?»
30 І прамовіў Карнэль: «Ад чацьвёртага дня аж да гэтае гадзіны я посьціў і а дзявятай гадзіне
маліўся ў доме маім; і вось, стаў перада мною муж у сьветлым адзеньні
31 і мовіць: “Карнэль, пачутая малітва твая, і міласьціны твае ўзгаданыя перад Богам.
32 Дык пашлі ў Ёппу і пакліч Сымона, які называецца Пятром; ён гасьцюе ў доме Сымона
гарбара, ля мора; ён, прыйшоўшы, скажа табе”.
33 Дык я неадкладна паслаў да цябе, і ты добра зрабіў, прыйшоўшы. А цяпер мы ўсе прыйшлі
перад [аблічча] Бога, каб слухаць усё, што загадана табе ад Бога».
34 А Пётар, расчыніўшы вусны, сказаў: «Праўдзіва спасьцерагаю, што не на аблічча зважае Бог,
35 але ў кожным народзе прыемны Яму той, хто баіцца Яго і чыніць праведнасьць.
36 Слова паслаў Ён сынам Ізраіля, дабравесьцячы супакой праз Ісуса Хрыста, Які ёсьць Госпад
усяго.

37 Вы ведаеце слова, што сталася па ўсёй Юдэі, пачынаючы ад Галілеі, пасьля хрышчэньня, якое абвясьціў Ян,
38 як Бог памазаў Духам Сьвятым і моцай Ісуса з Назарэту, Які хадзіў, робячы дабро і аздараўляючы ўсіх, прыгнятаных д'яблам, бо Бог быў з Ім.
39 І мы — сьведкі ўсяго, што Ён учыніў у краіне Юдэйскай і ў Ерусаліме. І забілі Яго, павесіўшы на дрэве.
40 Яго Бог уваскрасіў на трэці дзень, і даў Яму аб'яўляцца
41 не ўсяму народу, але сьведкам, наперад прызначаным ад Бога, нам, якія елі і пілі з Ім пасьля ўваскрасеньня Яго з мёртвых.
42 І Ён загадаў нам абвяшчаць народу і сьведчыць, што Ён ёсьць вызначаны ад Бога Судзьдзя жывых і мёртвых.
43 Пра Яго ўсе прарокі сьведчаць, што ўсякі, хто верыць у Яго, атрымае адпушчэньне грахоў праз імя Ягонае».
44 Калі Пётар яшчэ гаварыў словы гэтыя, зыйшоў Дух Сьвяты на ўсіх, якія слухалі слова.
45 І дзівіліся верныя з абрэзаных, якія прыйшлі з Пятром, што і на паганаў выліты дар Сьвятога Духа,
46 бо чулі іх, як гаварылі мовамі і ўзьвялічвалі Бога. Тады адказаў Пётар:
47 «Няўжо нехта можа забараніць [узяць] вады дзеля хрышчэньня тых, якія атрымалі Духа Сьвятога, як і мы?»
48 І загадаў ім ахрысьціцца ў імя Госпада. Тады прасілі яго застацца на некалькі дзён.

Дз 11

1 А апосталы і браты, якія былі ў Юдэі, пачулі, што і пагане прынялі слова Божае.
2 І калі Пётар узыйшоў у Ерусалім, тыя, што з абрэзаных, сумняваліся ў ім,
3 кажучы: «Да мужоў неабрэзаных ты хадзіў і еў з імі!»
4 А Пётар, пачаўшы, выклаў па парадку, кажучы:
5 «Я быў у горадзе Ёппе, молячыся, і ў захапленьні ўбачыў відзеж: нейкае начыньне, якое зыходзіла, быццам вялікі абрус, за чатыры канцы апусканы з неба, і прыйшло да мяне.
6 Углядаючыся ў яго, я разгледзеў і ўбачыў чатырохногіх зямных, і зьвяроў, і паўзуноў, і птушах нябесных.
7 Пачуў жа я голас, які гаварыў мне: "Устаўшы, Пётар, заколвай і еш".
8 А я сказаў: "Ніякім чынам, Госпадзе, бо нічога паганага ці нячыстага ніколі ня браў я ў вусны мае".
9 А голас адказаў мне другі раз з неба: "Што Бог ачысьціў, ты не пагань".
10 Сталася ж гэта тройчы, і ізноў усё ўзьнялося ў неба.
11 І вось, у гэты момант спыніліся перад домам, у якім я быў, тры мужы, пасланыя да мяне з Цэзарэі.
12 А Дух сказаў мне ісьці з імі, нічога не сумняваючыся. Пайшлі ж са мною і гэтыя шэсьць братоў, і мы прыйшлі ў дом таго мужа.
13 І абвясьціў ён нам, як бачыў у доме сваім анёла, які стаў і сказаў яму: "Пашлі ў Ёппу мужоў і пакліч Сымона, называнага Пятром,
14 які скажа табе словы, праз якія будзеш збаўлены ты і ўвесь дом твой".
15 Калі ж я пачаў гаварыць, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, як і на нас на пачатку.
16 І ўзгадаў я слова Госпада, як Ён сказаў: "Ян хрысьціў вадою, а вы будзеце ахрышчаны Духам Сьвятым".
17 Дык калі Бог даў ім такі самы дар, як і нам, што паверылі ў Госпада Ісуса Хрыста, хто ж я такі, каб мог забараняць Богу?»
18 Пачуўшы ж гэтае, яны супакоіліся і славілі Бога, кажучы: «Можа, і паганам даў Бог навяртаньне дзеля жыцьця».
19 А тыя, што расьцярушыліся пасьля ўціску, які стаўся з прычыны Стэфана, пайшлі аж да Фінікіі, і Кіпру, і Антыёхіі, нікому не гаворачы слова, адно толькі Юдэям.

20 Былі ж некаторыя з іх мужы Кіпрыйскія і Кірэнэйскія, якія, прыйшоўшы ў Антыёхію,
гаварылі да эліністаў, дабравесьцячы Госпада Ісуса.
21 І была рука Госпада з імі, і вялікая лічба, паверыўшы, зьвярнулася да Госпада.
22 А слова пра іх дайшло да вушэй царквы, што ў Ерусаліме, і яны паслалі Барнабу пайсьці аж
у Антыёхію.
23 Ён, прыйшоўшы і ўбачыўшы ласку Божую, узрадаваўся і маліў усіх, каб пры пастанове сэрца
трывалі ў Госпадзе,
24 бо ён быў муж добры і поўны Духа Сьвятога і веры. І значная грамада дадалася да Госпада.
25 А Барнаба выйшаў у Тарс шукаць Саўла і, знайшоўшы яго, прывёў у Антыёхію.
26 Сталася ж, што яны цэлы год зьбіраліся ў гэтай царкве і навучалі значную грамаду; у
Антыёхіі найперш вучняў сталі называць Хрысьціянамі.
27 У тыя ж дні прыйшлі з Ерусаліму ў Антыёхію прарокі.
28 А адзін з іх, на імя Агаў, устаўшы, праз Духа даў знак, што на ўсім сьвеце мае быць вялікі
голад, які і стаўся за цэзара Кляўдыя.
29 А вучні, кожны паводле магчымасьці сваёй, вызначылі паслаць [дапамогу] братам, што
жылі ў Юдэі.
30 І ўчынілі гэта, паслаўшы да старостаў праз рукі Барнабы і Саўла.

Дз 12

1 А ў той час валадар Ірад падняў руку, каб рабіць зло некаторым з царквы,
2 а Якуба, брата Яна, забіў мячом.
3 І, бачачы, што гэта падабаецца Юдэям, дадаў, што схапіў і Пятра, а былі дні праснакоў,
4 і, схапіўшы, пасадзіў у вязьніцу, загадаўшы чатыром чацьвёркам жаўнераў сьцерагчы яго,
хочучы пасьля Пасхі вывесьці яго народу.
5 Дык Пятра пільнавалі ў вязьніцы, а шчырая малітва за яго ўзносілася ад царквы да Бога.
6 Калі ж Ірад меўся вывесьці яго, у тую ноч Пётар спаў між двух жаўнераў, зьвязаны двума
ланцугамі, і перад дзьвярыма вартаўнікі пільнавалі вязьніцу.
7 І вось, анёл Госпада стаў, і сьвятло засьвяціла ў цэлі, і, ударыўшы Пятра ў бок, падняў яго,
кажучы: «Устань хутчэй!» І ўпалі з рук ягоных ланцугі.
8 Анёл жа сказаў да яго: «Падпержыся і азуй сандалы твае». Ён зрабіў гэта, і той кажа яму:
«Апрані адзеньне тваё і ідзі за мною».
9 І, выйшаўшы, пайшоў за ім, і ня ведаў, ці праўда тое, што сталася праз анёла, а думаў, што
бачыць відзеж.
10 Абмінуўшы ж першую варту і другую, яны падыйшлі да жалезных брамаў, што вялі ў горад,
якія самі расчыніліся ім, і, выйшаўшы, прайшлі адну вуліцу, і анёл адразу адыйшоў ад яго.
11 І Пётар, прыйшоўшы ў сябе, сказаў: «Цяпер праўдзіва ведаю, што Госпад паслаў анёла
Свайго і вырваў мяне з рукі Ірада і з усяго, чаго чакаў народ Юдэйскі».
12 І, агледзеўшыся, прыйшоў у дом Марыі, маці Яна, называнага Маркам, дзе многія сабраліся
і маліліся.
13 А калі Пётар грукаўся ў дзьверы брамаў, падыйшла паслухаць служка, на імя Рода,
14 і, пазнаўшы голас Пятра, ад радасьці не адчыніла брамаў, а, убегшы, абвясьціла, што Пётар
стаіць перад брамамі.
15 Яны ж сказалі да яе: «Ты звар'яцела». А яна настойвала, што гэта ён. Яны ж казалі: «Гэта
анёл ягоны».
16 А Пётар працягваў грукацца. Адчыніўшы, яны ўбачылі яго і зьдзівіліся.
17 Ён жа, даўшы знак рукою, каб маўчалі, распавёў ім, як Госпад вывеў яго з вязьніцы. І сказаў:
«Абвясьціце пра гэта Якубу і братам». І, выйшаўшы, пайшоў у іншае месца.
18 А як настаў дзень, было хваляваньне немалое ў жаўнераў адносна таго, што магло стацца з
Пятром.
19 Ірад жа, шукаючы яго і не знайшоўшы яго, дапытаўшы вартаўнікоў, загадаў вывесьці іх [на
сьмерць]. І, зыйшоўшы з Юдэі ў Цэзарэю, быў [там].

20 А быў Ірад дужа зазлаваны на Тырыянаў і Сідонцаў. Яны ж аднадушна прыйшлі да яго і,
пераканаўшы Бласта, падкаморага валадарскага, прасілі міру, бо іхняя краіна жывілася ад
валадарскае.
21 У вызначаны ж дзень Ірад, апрануўшы валадарскае адзеньне і сеўшы на судовым пасадзе,
прамаўляў да іх,
22 а народ крычаў: «Голас бога, а не чалавека!»
23 А анёл Госпада адразу ўдарыў яго за тое, што ён не аддаў славу Богу, і, заедзены чэрвямі, ён
памёр.
24 А слова Божае расло і памнажалася.
25 А Барнаба і Саўл, споўніўшы служэньне, вярнуліся з Ерусаліму, узяўшы з сабою Яна, якога
звалі Маркам.

Дз 13

1 Былі ж у Антыёхіі, у тамтэйшай царкве, некаторыя прарокі і настаўнікі: і Барнаба, і Сымон,
называны Нігер, і Луцый Кірэнэец, і Манаэн, што гадаваўся разам з Ірадам тэтрархам, і Саўл.
2 А калі яны спраўлялі служэньне Госпаду і посьцілі, сказаў Дух Сьвяты: «Аддзяліце Мне
Барнабу і Саўла на справу, на якую Я паклікаў іх».
3 Тады яны, посьцячы і молячыся, і ўскладаючы на іх рукі, адпусьцілі іх.
4 Тыя ж, выпраўленыя Духам Сьвятым, прыйшлі ў Сэлеўкію, і адтуль паплылі на Кіпр.
5 І, апынуўшыся ў Саляміне, прапаведвалі слова Божае ў сынагогах Юдэйскіх; а мелі яны Яна
за паслугача.
6 Прайшоўшы ж востраў да Пафа, знайшлі нейкага чараўніка, фальшывага прарока, Юдэя, на
імя Бар-Ісус,
7 які быў у праконсула Сяргея Паўла, мужа разумнага. Той, паклікаўшы Барнабу і Саўла, шукаў
слухаць слова Божае.
8 а чараўнік Эліма, бо так перакладаецца імя ягонае, супрацьстаяў ім, шукаючы адвярнуць
праконсула ад веры.
9 А Саўл, ён жа Павал, напоўніўшыся Духам Сьвятым і ўглядаючыся на яго,
10 сказаў: «О, сыне д'ябла, поўны ўсякае падступнасьці і ўсякай ліхоты, вораг усякае
праведнасьці! Ці не перастанеш ты крывіць простыя шляхі Госпада?
11 І вось цяпер рука Госпада над табою, і будзеш ты сьляпы, ня бачачы сонца да часу». І адразу
зыйшлі на яго змрок і цемра, і ён, блукаючыся, шукаў, хто б яго вёў за руку.
12 Тады праконсул, убачыўшы, што сталася, паверыў, дзівячыся вучэньню Госпада.
13 А тыя, што з Паўлам, выйшаўшы з Пафу, прыйшлі ў Пэргію ў Памфіліі. Ян жа, адыйшоўшы
ад іх, вярнуўся ў Ерусалім.
14 А яны, прайшоўшы Пэргію, прыйшлі ў Антыёхію Пісідзкую і, увайшоўшы ў сынагогу ў дзень
суботы, паселі.
15 А пасьля чытаньня Закону і Прарокаў начальнікі сынагогі паслалі да іх, кажучы: «Мужы
браты! Калі ёсьць у вас слова пацяшэньня для народу, кажыце».
16 Павал жа, устаўшы і даўшы знак рукою, сказаў: «Мужы Ізраільцяне і тыя, хто баіцца Бога,
паслухайце!
17 Бог народу гэтага, Ізраіля, выбраў бацькоў нашых, і ўзьвялічыў народ, калі яны былі
прыхаднямі ў зямлі Эгіпецкай, і ўзьнятым рамяном вывеў іх з яе,
18 і на працягу сарака гадоў зносіў іх у пустыні,
19 і, зьнішчыўшы сем народаў у зямлі Ханаан, даў ім на ўласнасьць зямлю іхнюю.
20 І пасьля гэтага каля чатырохсот і пяцідзесяці гадоў даваў судзьдзяў да Самуэля прарока.
21 У той час прасілі яны валадара; і даў ім Бог Саўла, сына Кісавага, мужа з калена Бэн'яміна,
гадоў на сорак.
22 І, адставіўшы яго, паставіў ім за валадара Давіда, пра якога і сказаў, сьведчачы: "Знайшоў Я
Давіда, сына Есэя, мужа паводле сэрца Майго, які выканае ўсю волю Маю".
23 З ягонага насеньня Бог паводле абяцаньня падняў Ізраілю Збаўцу Ісуса.

24 Перад абліччам прыйсьця Ягонага абвяшчаў Ян хрышчэньне навяртаньня ўсяму народу
Ізраіля.
25 А калі Ян споўніў бег свой, ён сказаў: “За каго лічыце мяне? Ня я гэта, але, вось, ідзе за мною
Той, Якому я ня варты разьвязаць сандалы на нагах”.
26 Мужы браты, сыны роду Абрагамавага і тыя сярод вас, якія Бога баяцца! Вам пасланае слова
збаўленьня гэтага.
27 Бо жыхары Ерусаліму і начальнікі іхнія, не пазнаўшы Яго і асудзіўшы, споўнілі словы
прарокаў, чытаныя кожную суботу,
28 і, не знайшоўшы ніякае сьмяротнае віны, прасілі Пілата, каб Ён быў забіты.
29 Калі ж зьдзейсьнілі ўсё, напісанае пра Яго, зьняўшы з дрэва, палажылі ў магілу.
30 Але Бог уваскрасіў Яго з мёртвых.
31 Ён шмат дзён зьяўляўся тым, якія прыйшлі з Ім з Галілеі ў Ерусалім і якія ёсьць сьведкамі
Яго перад народам.
32 І мы вам дабравесьцім, што абяцаньне, дадзенае бацькам, Бог споўніў нам, іхнім дзецям,
уваскрасіўшы Ісуса,
33 як і ў другім псальме напісана: “Ты — Сын Мой, Я сёньня нарадзіў Цябе”.
34 А што Ён уваскрасіў Яго з мёртвых, каб Той больш не вярнуўся ў парахненьне, Ён сказаў
гэтак: “Дам вам сьвятасьці Давідавыя верныя”.
35 Дзеля гэтага і ў іншым [псальме] кажа: “Не дасі Сьвятому Твайму ўбачыць парахненьне”.
36 Бо Давід, паслужыўшы ў сваім пакаленьні намеру Божаму, памёр і далучыўся да бацькоў
сваіх, і ўбачыў парахненьне,
37 а Той, Каго Бог уваскрасіў, ня ўбачыў парахненьня.
38 Дык няхай будзе вядома вам, мужы браты, што праз Яго прапаведуецца вам адпушчэньне
грахоў,
39 і ў-ва ўсім, у чым вы не маглі апраўдацца ў законе Майсеевым, у Ім апраўдваецца кожны,
хто верыць.
40 Дык глядзіце, каб не прыйшло на вас сказанае ў прарокаў:
41 “Пабачце, вы, якія пагарджаеце, і зьдзівіцеся, і шчэзьніце, бо Я раблю справу ў дні вашыя,
справу, якой вы не паверыце, калі хто распавядзе вам”».
42 Калі ж яны выходзілі з сынагогі Юдэйскае, прасілі іх пагане, каб і ў наступную суботу
гаварылі словы гэтыя.
43 А як разыйшлася сынагога, шмат Юдэяў і пабожных празэлітаў пайшлі за Паўлам і
Барнабам, якія, размаўляючы з імі, пераконвалі іх заставацца ў ласцы Божай.
44 А ў наступную суботу амаль увесь горад сабраўся слухаць слова Божае.
45 А Юдэі, убачыўшы натоўп, напоўніліся зайздрасьцю і працівіліся таму, што гаварыў Павал,
пярэчачы і блюзьнячы.
46 А Павал і Барнаба, адважыўшыся, сказалі: «Да вас належала спачатку гаварыць слова Божае.
А як вы адкідаеце яго і ня лічыце сябе вартымі жыцьця вечнага, вось, мы паварочваемся да
паганаў.
47 Бо так загадаў нам Госпад: “Я паставіў цябе як сьвятло для паганаў, каб быў ты на
збаўленьне да краю зямлі”».
48 А пагане, чуючы гэта, радаваліся і славілі слова Госпада, і паверылі ўсе, якія былі
прызначаныя да жыцьця вечнага.
49 І разносілася слова Госпада праз усю краіну.
50 А Юдэі падбухторылі пабожных і паважаных жанчынаў, і першых [людзей] у горадзе, і
паднялі перасьлед на Паўла і Барнабу, і выгналі іх з межаў сваіх.
51 Яны ж, абтросшы пыл з ног сваіх на іх, прыйшлі ў Іконію.
52 А вучні былі напоўненыя радасьцю і Духам Сьвятым.

Дз 14

1 Сталася ж у Іконіі, што ўвайшлі яны разам у сынагогу Юдэйскую і гаварылі гэтак, што

паверыла вялікае мноства Юдэяў і Грэкаў.
2 А Юдэі, якія ня верылі, паднялі і раз'юшылі супраць братоў душы паганаў.
3 Аднак яны былі там даволі часу, адважна гаворачы пра Госпада, Які сьведчыў пра слова ласкі Сваёй і чыніў знакі і цуды праз рукі іхнія.
4 І падзялілася мноства ў горадзе, і адны былі з Юдэямі, а другія — з апосталамі.
5 А калі пагане і Юдэі з начальнікамі сваімі намерваліся зьняважыць і ўкаменаваць іх,
6 яны, даведаўшыся, уцяклі ў гарады Лікаонскія Лістру і Дэрбу, і ў ваколіцу,
7 і былі там, дабравесьцячы.
8 І нейкі чалавек у Лістры, немачны на ногі, сядзеў, бо ад чэрава маці сваёй быў кульгавы і ніколі не хадзіў.
9 Ён слухаў Паўла, які гаварыў, і той, глянуўшы на яго і бачачы, што ён мае веру дзеля збаўленьня,
10 сказаў моцным голасам: «Стань на ногі твае проста!» І ён падскочыў, і хадзіў.
11 А натоўп, бачачы, што зрабіў Павал, падняў голас свой, кажучы па-лікаонску: «Богі, падобныя да людзей, зыйшлі да нас!»
12 І называлі Барнабу Зэўсам, а Паўла — Гермэсам, бо ён быў правадыром у слове.
13 А сьвятар Зэўса, што стаяў перад горадам іхнім, прывёўшы валоў з вянкамі да брамаў, хацеў разам з натоўпам закалоць іх [у ахвяру].
14 Апосталы ж Барнаба і Павал, пачуўшы [пра гэта], разьдзёршы адзеньне сваё, кінуліся ў натоўп, крычучы і кажучы:
15 «Мужы! Што вы гэта робіце? І мы падобныя да вас людзі, якія дабравесьцім вам, каб адвярнуліся ад гэтых марнасьцяў да Бога Жывога, Які стварыў неба, і зямлю, і мора, і ўсё, што ў іх,
16 Які ў мінулых пакаленьнях пакінуў усе народы хадзіць сваімі шляхамі,
17 ды не пакінуў сьведчыць пра Сябе, робячы дабро, даючы нам з неба дажджы і поры ўраджайныя, напаўняючы ежай і радасьцю сэрцы нашыя!»
18 І, гаворачы гэтае, ледзь супакоілі натоўп, каб не заколвалі [ахвяры] для іх.
19 А з Антыёхіі і Іконіі прыйшлі Юдэі і, намовіўшы натоўп і ўкаменаваўшы Паўла, вывалаклі яго за горад, думаючы, што ён памёр.
20 Калі ж акружылі яго вучні, ён, устаўшы, увайшоў у горад і на заўтра выйшаў з Барнабам у Дэрбу.
21 І дабравесьціўшы гэтаму гораду, і навучыўшы многіх, яны вярнуліся ў Лістру і Іконію, і Антыёхію,
22 умацоўваючы душы вучняў, просячы трываць у веры і што праз шмат мукаў мусім мы ўвайсьці ў Валадарства Божае.
23 І, ускладаючы рукі, яны [паставілі] ім старостаў у кожнай царкве, і, памаліўшыся з постам, даручылі іх Госпаду, у Якога яны паверылі.
24 І, прайшоўшы праз Пісыдыю, прыйшлі ў Памфілію.
25 І, прамовіўшы слова ў Пэргіі, зыйшлі ў Аталію.
26 Адтуль паплылі ў Антыёхію, адкуль былі аддадзеныя ласцы Божай на справу, якую выканалі.
27 Прыйшоўшы і сабраўшы царкву, яны расказалі, што ўчыніў з імі Бог і як расчыніў дзьверы веры паганам.
28 І былі яны там немалы час з вучнямі.

Дз 15

1 І некаторыя, што прыйшлі з Юдэі, навучалі братоў: «Калі ня будзеце абрэзаны паводле звычаю Майсея, ня можаце быць збаўленыя».
2 Тады сталася немалое змаганьне і спрэчка з імі ў Паўла і Барнабы, і вызначылі, каб Павал, і Барнаба, і некаторыя іншыя з іх узыйшлі наконт гэтай спрэчкі да апосталаў і старостаў у Ерусалім.

3 Яны ж, праведзеныя царквою, праходзілі праз Фінікію і Самарыю, распавядаючы пра навяртаньне паганаў; і зрабілі радасьць вялікую ўсім братам.
4 А прыйшоўшы ў Ерусалім, яны былі прынятыя царквою, і апосталамі, і старостамі, і расказалі ўсё, што Бог учыніў з імі.
5 Падняліся ж некаторыя з герэзіі фарысэйскае, якія былі паверыўшыя, кажучы, што трэба іх абрэзаць і загадаць захоўваць закон Майсея.
6 І сабраліся апосталы і старосты разгледзець наконт слова гэтага.
7 А як сталася вялікая спрэчка, Пётар, устаўшы, сказаў ім: «Мужы браты! Вы ведаеце, што ад дзён старадаўных Бог выбраў сярод нас, каб праз мае вусны пачулі пагане слова Эвангельля і паверылі.
8 І Знаўца сэрцаў, Бог, засьведчыў ім, даўшы ім Духа Сьвятога, як і нам,
9 і ніяк не адрозьніў між намі і імі, вераю ачысьціўшы сэрцы іхнія.
10 Дык цяпер навошта вы спакушаеце Бога, каб ускласьці на шыі вучняў ярмо, насіць якое ня здолелі ані бацькі нашыя, ані мы?
11 Але мы верым, што збаўленыя праз ласку Госпада Ісуса Хрыста, гэтаксама, як і яны».
12 І замаўчала ўсё мноства, і слухалі Барнабу і Паўла, якія распавядалі, якія знакі і цуды ўчыніў праз іх Бог сярод паганаў.
13 Калі ж яны замаўчалі, адказаў Якуб, кажучы: «Мужы браты! Паслухайце мяне!
14 Сымон распавёў, як спачатку Бог нагледзеў узяць з паганаў народ дзеля імя Свайго,
15 і з гэтым згаджаюцца словы Прарокаў, як напісана:
16 “Пасьля гэтага вярнуся, і адбудую намёт Давіда, які заваліўся, і зруйнаванае ў ім адбудую, і выпрастую яго,
17 каб шукалі Госпада пазасталыя людзі і ўсе народы, над якімі будуць клікаць імя Маё, — кажа Госпад, Які робіць усё гэта”.
18 Ад вякоў вядомыя Богу ўсе справы Ягоныя.
19 Дзеля гэтага я суджу ня мучыць тых з паганаў, якія зьвярнуліся да Бога,
20 але напісаць ім, каб высьцерагаліся гідотаў ідальскіх, і распусты, і душанага, і крыві;
21 бо [закон] Майсея ад старадаўніх пакаленьняў мае ў гарадах тых, хто абвяшчае яго, чытаны ў сынагогах кожную суботу».
22 Тады надумалі апосталы і старосты разам з усёй царквою, выбраўшы спасярод сябе мужоў, паслаць у Антыёхію з Паўлам і Барнабам Юду, называнага Барсабам, і Сілу, мужоў кіраўнікоў сярод братоў,
23 напісаўшы рукамі сваімі гэтак: «Апосталы, і старосты, і браты — братам з паганаў у Антыёхіі і Сірыі, і Кілікіі: радавацца!
24 Пачуўшы, што некаторыя, што прыйшлі ад нас, устрывожылі вас словамі, захістаўшы душы вашыя, кажучы абрэзывацца і захоўваць Закон, чаго мы не загадвалі,
25 надумалі мы, сабраўшыся аднадушна, паслаць да вас выбраных мужоў разам з улюбёнымі нашымі Барнабам і Паўлам,
26 людзьмі, якія аддалі душы свае за імя Госпада нашага Ісуса Хрыста.
27 Дык паслалі мы Юду і Сілу, і яны словамі паведамяць тое самае.
28 Бо надумалася Духу Сьвятому і нам ніякага больш цяжару на вас не ўскладаць, акрамя гэтага неабходнага:
29 сьцерагчыся ахвяраў ідалам, і крыві, і душанага, і распусты. Захоўваючы сябе ад гэтага, зробіце добра. Бывайце здаровыя».
30 Тады тыя, што былі пасланыя, прыйшлі ў Антыёхію і, сабраўшы мноства, аддалі пасланьне.
31 А тыя, прачытаўшы, узрадаваліся ад гэтага пацяшэньня.
32 Юда і Сіла, якія былі і прарокамі, многімі словамі пацяшалі братоў і ўмацоўвалі.
33 Прабыўшы ж там [нейкі] час, яны былі ў супакоі пасланыя братамі да апосталаў.
34 А Сіле надумалася застацца там.
35 А Павал і Барнаба былі ў Антыёхіі, навучаючы і дабравесьцячы разам з многімі другімі слова Госпадава.

36 І праз колькі дзён сказаў Павал да Барнабы: «Вярнуўшыся, адведаем братоў нашых у-ва ўсіх
гарадах, у якіх мы прапаведвалі слова Госпада, як яны маюцца».
37 Барнаба ж пастанавіў узяць з сабою Яна, называнага Маркам.
38 А Павал лічыў, што няварта браць яго з сабою, бо ён адыйшоў ад іх у Памфіліі і не пайшоў з
імі на гэтую справу.
39 Тады сталася спрэчка, так што яны разлучыліся адзін з адным, і Барнаба, узяўшы Марка,
паплыў на Кіпр.
40 А Павал, паклікаўшы Сілу, пайшоў, аддадзены братамі ласцы Божай,
41 і праходзіў праз Сірыю і Кілікію, умацоўваючы цэрквы.

Дз 16

1 І прыйшоў ён у Дэрбу і Лістру. І вось, быў там адзін вучань, на імя Цімафей, сын аднае
жанчыны Юдэйскае вернае і бацькі Грэка.
2 Пра яго сьведчылі браты ў Лістры і Іконіі.
3 Павал захацеў, каб ён пайшоў з ім, і, узяўшы яго, абрэзаў дзеля Юдэяў, якія былі ў тых месцах,
бо ўсе ведалі бацьку ягонага, што быў Грэк.
4 Калі ж яны праходзілі праз гарады, перадавалі [цэрквам] захоўваць пастановы, вызначаныя
апосталамі і старостамі ў Ерусаліме.
5 А цэрквы ўмацоўваліся ў веры і ўзрасталі штодня лікам.
6 Прайшоўшы ж праз Фрыгію і Галятыйскую краіну, забараніў ім Сьвяты Дух гаварыць слова ў
Азіі.
7 Прыйшоўшы ў Мізію, спрабавалі ісьці ў Бітынію; і не дазволіў ім Дух.
8 І, абмінуўшы Мізію, яны зыйшлі ў Трааду.
9 І ўгледзеў Павал уначы відзеж: нейкі муж, Македонец, стаяў, просячы яго і кажучы:
«Перайшоўшы ў Македонію, дапамажы нам».
10 Калі ж убачыў ён відзеж, мы адразу шукалі, каб ісьці ў Македонію, разумеючы, што Госпад
паклікаў нас дабравесьціць ім.
11 І, паплыўшы з Траады, мы наўпрост прыйшлі ў Саматракію, а на заўтра — у Нэапаль,
12 і адтуль — у Філіпы, што ёсьць першы горад тае часткі Македоніі, калёнія. І былі мы ў гэтым
горадзе некалькі дзён.
13 І ў дзень суботы выйшлі мы за горад да рэчкі, дзе звычайна адбывалася малітва, і, пасеўшы,
гаварылі да сабраных жанчынаў.
14 І слухала адна жанчына, на імя Лідзія, гандлярка пурпурам, з гораду Тыятыра, якая
пакланялася Богу, і Госпад адчыніў сэрца ейнае, каб зважала на прамову Паўла.
15 А калі ахрысьцілася яна і дом ейны, яна прасіла, кажучы: «Калі вы лічыце мяне вернай
Госпаду, увайшоўшы ў дом мой, жывіце». І затрымала нас.
16 Сталася ж, як ішлі мы на малітву, сустрэла нас нейкая служка, якая мела духа вешчага і,
варожачы, вялікі заробак давала гаспадарам сваім.
17 Яна, ідучы за Паўлам і намі, крычала, кажучы: «Людзі гэтыя — слугі Бога Найвышэйшага,
якія прапаведуюць нам шлях збаўленьня!»
18 А рабіла яна гэта шмат дзён. Павал жа, узлаваўшыся, павярнуўся і сказаў духу: «Загадваю
табе ў імя Ісуса Хрыста выйсьці з яе!» І ён выйшаў у той жа час.
19 А гаспадары ейныя, бачачы, што прапала надзея заробку іхняга, схапіўшы Паўла і Сілу,
пацягнулі на рынак да начальнікаў.
20 І прывёўшы іх да войтаў, сказалі: «Гэтыя людзі трывожаць наш горад, а яны — Юдэі,
21 і прапаведуюць звычаі, якіх нам, Рымлянам, ня сьлед ані прыймаць, ані рабіць».
22 І паўстаў натоўп супраць іх, і войты, сарваўшы з іх адзеньне, загадалі біць іх кіямі.
23 І зрабіўшы ім шмат ранаў, кінулі іх у вязьніцу, загадаўшы ахоўніку старанна пільнаваць іх.
24 Ён, атрымаўшы гэткі загад, кінуў іх ва ўнутраную вязьніцу і ногі іхнія паўшчамляў у калоду.
25 Каля паўночы Павал і Сіла, молячыся, сьпявалі Богу, а вязьні чулі іх.

26 Раптам стаўся вялікі землятрус, так што захісталіся падмуркі вязьніцы; і адразу адчыніліся
ўсе дзьверы, і ў-ва ўсіх паслаблі путы.
27 Ахоўнік жа, прачнуўшыся і бачачы адчыненыя дзьверы вязьніцы, дастаўшы меч, меўся
забіць сябе, думаючы, што вязьні паўцякалі.
28 А Павал закрычаў моцным голасам, кажучы: «Не рабі сабе ніякага ліха, бо ўсе мы тут!»
29 Ён жа, папрасіўшы сьвятла, убег і, трасучыся, упаў перад Паўлам і Сілаю,
30 і, выводзячы іх вонкі, сказаў: «Панове, што я мушу рабіць, каб быць збаўленым?»
31 А яны сказалі: «Вер у Госпада Ісуса Хрыста, і будзеш збаўлены ты і дом твой».
32 І гаварылі слова Госпадава яму і ўсім, хто ў доме ягоным.
33 І ў тую ж гадзіну ўначы ён, узяўшы іх, памыў ім раны, і адразу быў ахрышчаны сам і ўсе
ягоныя.
34 І, завёўшы іх у дом свой, паставіў стол і радаваўся з усім домам, што паверыў у Бога.
35 А як настаў дзень, паслалі войты жандараў, кажучы: «Вызваль людзей гэтых».
36 Ахоўнік жа паведаміў словы гэтыя Паўлу: «Войты паслалі, каб цяпер вызваліць вас. Дык,
выйшаўшы, ідзіце ў супакоі».
37 А Павал прамовіў да іх: «Нас, людзей Рымскіх, без суду зьбіўшы прынародна, кінулі ў
вязьніцу, і цяпер цішком выганяюць нас? О, не! Але няхай самі, прыйшоўшы, вывядуць нас».
38 Жандары абвясьцілі словы гэтыя войтам, і тыя спалохаліся, пачуўшы, што яны — Рымляне.
39 І, прыйшоўшы, перапрашалі іх, і, вывеўшы, прасілі пайсьці з гораду.
40 Выйшаўшы ж з вязьніцы, яны прыйшлі да Лідзіі, і, убачыўшы братоў, суцяшалі іх, і пайшлі.

Дз 17

1 А прайшоўшы праз Амфіпаль і Апалёнію, прыйшлі ў Тэсалоніку, дзе была сынагога Юдэйская.
2 І Павал, паводле звычаю, прыйшоў да іх і тры суботы вёў гутаркі з імі з Пісаньня,
3 паказваючы і адкрываючы, што Хрыстос мусіў цярпець і ўваскрэснуць з мёртвых і што: «Гэты
Ісус, пра Якога я абвяшчаю вам, ёсьць Хрыстос».
4 І некаторыя з іх былі перакананыя і далучыліся да Паўла і Сілы, і вялікае мноства Грэкаў, якія
пакланяліся [Богу], і жанчынаў першых нямала.
5 А Юдэі, якія не паверылі, зайздросьцячы і паклікаўшы нейкіх нягодных мужоў з плошчы,
учынілі натоўп і ўзрушылі горад. І, стаўшы каля дому Язона, шукалі іх, каб прывесьці да
народу.
6 Не знайшоўшы ж іх, пацягнулі Язона і некаторых братоў да бурмістраў, крычучы, што гэтыя
сусьветныя бунтаўнікі прыйшлі і сюды,
7 а Язон іх прыняў, і што яны ўсё чыняць супраць пастановаў цэзара, называючы іншага
валадаром, Ісуса.
8 І, чуючы гэта, устрывожыўся натоўп і бурмістры,
9 але, узяўшы заклад ад Язона і рэшты, вызвалілі іх.
10 Браты ж адразу ўначы выправілі Паўла і Сілу ў Бэрэю, і тыя, прыйшоўшы, пайшлі ў сынагогу
Юдэйскую.
11 А гэтыя былі высакароднейшыя, чым у Тэсалоніцы; яны прынялі слова з усёй ахвотаю,
штодня дасьледуючы Пісаньне, ці гэтак яно ёсьць.
12 Тады шмат з іх паверыла, і жанчынаў Грэцкіх паважаных, і мужчынаў нямала.
13 Калі ж Юдэі з Тэсалонікі даведаліся, што і ў Бэрэі абвяшчаецца праз Паўла слова Божае,
прыйшлі і сюды, падбухторваючы натоўп.
14 Тады браты адразу паслалі Паўла, каб ішоў быццам да мора, а Сіла і Цімафей засталіся там.
15 Тыя ж, што праводзілі Паўла, прывялі яго ў Атэны і, атрымаўшы прыказаньне для Сілы і
Цімафея, каб чым хутчэй ішлі да яго, пайшлі.
16 А калі Павал чакаў на іх у Атэнах, узрушыўся ў ім дух ягоны, бачачы горад, апанаваны
ідаламі.
17 Дык ён вёў гутаркі ў сынагозе з Юдэямі і пабожнымі, і на рынку кожны дзень з тымі, з кім
надарыцца.

18 Некаторыя ж з філосафаў эпікурэйцаў і стоікаў спрачаліся з ім, і адны казалі: «Што
хоча сказаць гэты баўбатун?», а другія: «Здаецца, ён прапаведуе чужыя боствы», — бо ён
дабравесьціў ім пра Ісуса і ўваскрасеньне Ягонае.
19 І, узяўшы яго, прывялі ў арэапаг, кажучы: «Ці можам мы ведаць, што гэта за новае вучэньне
ты распавядаеш?
20 Бо нешта незвычайнае ты ўкладаеш у вушы нашыя, дык хочам ведаць, што гэта мае быць?»
21 Усе ж Атэнцы і прыйшоўшыя [туды] чужынцы ні чым іншым ня бавіліся, як гаварыць і
слухаць нешта новае.
22 А Павал, стаўшы пасярод арэапагу, прамовіў: «Мужы Атэнскія! З усяго я бачу, што вы
быццам асабліва пабожныя.
23 Бо, праходзячы і аглядаючы месцы пакланеньня вашыя, знайшоў я і ахвярнік, на якім
напісана: “Невядомаму Богу”. Дык Таго, Каго вы, ня ведаючы, ушаноўваеце, я вам абвяшчаю.
24 Бог, Які стварыў сьвет і ўсё, што ў ім, Які ёсьць Госпад неба і зямлі, не жыве ў бажніцах,
зробленых рукамі,
25 і не ўтрымліваецца ад рук чалавечых, быццам нечага патрабуючы, Сам даючы ўсім жыцьцё,
і дыханьне, і ўсё.
26 Ён учыніў з аднае крыві кожны народ чалавечы, каб жылі на ўсім абліччы зямлі,
вызначыўшы акрэсьленыя часы і межы пражываньня іхняга,
27 каб шукалі Госпада, можа, дакрануцца Яго і знойдуць, хоць Ён і недалёка ад кожнага з нас,
28 бо ў Ім мы жывем, і рухаемся, і існуем, як і некаторыя з вашых паэтаў гавораць: “Бо мы і
род Ягоны”.
29 Дык мы, як род Божы, не павінны думаць, быццам Боства падобнае да золата, ці срэбра, ці
камяня, назначанага майстэрствам і думкаю чалавечай.
30 Дык Бог, зважаючы на часы няведаньня, загадвае цяпер усім людзям паўсюль навярнуцца,
31 бо прызначыў дзень, у які мае судзіць сусьвет паводле справядлівасьці праз Мужа, Якога
вызначыў, даўшы ўсім пэўнасьць, уваскрасіўшы Яго з мёртвых».
32 Пачуўшы ж пра ўваскрасеньне мёртвых, адны кпілі, а другія казалі: «Паслухаем цябе пра
гэта другім разам!»
33 І гэтак Павал выйшаў спасярод іх.
34 А некаторыя мужчыны, якія прысталі да яго, паверылі; між імі і Дыяніс Арэапагіт, і жанчына
на імя Дамар, і іншыя з імі.

Дз 18

1 Пасьля ж гэтага Павал, зыйшоўшы з Атэнаў, прыйшоў у Карынт.
2 І, знайшоўшы нейкага Юдэя, на імя Акіла, родам з Понту, і жонку ягоную Прыскілу, якія
толькі што прыйшлі з Італіі дзеля загаду Кляўдыя ўсім Юдэям пакінуць Рым, прыстаў да іх.
3 І як быў аднаго рамяства [з імі], заставаўся ў іх і працаваў, бо рамяство [іхняе] было
майстраваньне намётаў.
4 А кожную суботу ён вёў гутаркі ў сынагозе і пераконваў Юдэяў і Грэкаў.
5 Калі ж прыйшлі з Македоніі Сіла і Цімафей, Павал быў пануканы Духам сьведчыць Юдэям
пра Ісуса Хрыста.
6 А як яны працівіліся і блюзьнілі, абтросшы адзеньне, ён сказаў да іх: «Кроў вашая на галаве
вашай! Я чысты. Ад цяпер іду да паганаў».
7 І, перайшоўшы адтуль, прыйшоў у дом нейкага [чалавека], на імя Юст, які пакланяўся Богу,
дом якога быў пры самай сынагозе.
8 А Крысп, начальнік сынагогі, паверыў у Госпада разам з усім домам сваім, і шмат
Карыньцянаў, слухаючы, паверылі і былі ахрышчаныя.
9 Госпад жа сказаў Паўлу ў відзежы ўначы: «Ня бойся, але гавары і не маўчы,
10 бо Я з табою, і ніхто ня ўчыніць табе зло, бо шмат Майго народу ў горадзе гэтым».
11 І жыў год і шэсьць месяцаў, навучаючы ў іх слова Божага.

12 А калі Галіён стаў праконсулам Ахаі, Юдэі аднадушна накінуліся на Паўла і павялі яго да
судовага пасаду,
13 кажучы, што ён намаўляе людзей пакланяцца Богу насуперак Закону.
14 Калі ж Павал меўся расчыніць вусны, сказаў Галіён да Юдэяў: «Калі б сапраўды была нейкая
крыўда ці злачынства, о Юдэі, я б меў прычыну цярпець вас.
15 Калі ж спрэчка ідзе пра слова, і імёны, і Закон ваш, разглядайце самі, бо я судзьдзём у гэтым
быць не хачу».
16 І пагнаў іх ад судовага пасаду.
17 А ўсе Грэкі, схапіўшы Састэна, начальніка сынагогі, білі яго перад судовым пасадам, Галіёна
ж гэта ніколькі не клапаціла.
18 А Павал, прабыўшы яшчэ даволі дзён, разьвітаўшыся з братамі, паплыў у Сірыю, і з ім
Прыскіла і Акіла. У Кенхрэях ён абстрыг галаву, бо зрабіў шлюбаваньне.
19 І прыйшоў у Эфэс, і пакінуў іх, а сам, увайшоўшы ў сынагогу, вёў гутаркі з Юдэямі.
20 Калі ж прасілі яго застацца ў іх на шмат часу, ён не згадзіўся,
21 але разьвітаўся з імі, сказаўшы: «Я мушу абавязкова справіць надыходзячае сьвята ў
Ерусаліме. А зноў вярнуся да вас, калі Бог захоча». І вырушыў з Эфэсу.
22 І, зыйшоўшы ў Цэзарэі, узыйшоўшы і прывітаўшы царкву, пайшоў у Антыёхію.
23 І пабавіўшы [там] нейкі час, выйшаў, праходзячы па чарзе Галятыйскую краіну і Фрыгію,
умацоўваючы ўсіх вучняў.
24 А нейкі Юдэй, на імя Апалёс, родам Александрыец, муж красамоўны, прыйшоў у Эфэс, а
быў ён моцны ў Пісаньнях.
25 Ён быў навучаны шляху Госпада і, палаючы духам, гаварыў і навучаў пра Госпада дакладна,
ведаючы толькі хрышчэньне Янавае.
26 І ён пачаў адважна гаварыць у сынагозе. Пачуўшы ж яго, Акіла і Прыскіла адклікалі яго і
выклалі яму дакладней шлях Божы.
27 А як ён хацеў пайсьці ў Ахаю, браты напісалі вучням, заклікаючы прыняць яго. Ён,
прыйшоўшы, шмат дапамог тым, што былі паверыўшы праз ласку,
28 бо заўзята абвяргаў Юдэяў перад грамадою, паказваючы з Пісаньняў, што Ісус ёсьць
Хрыстос.

Дз 19

1 Сталася ж, калі Апалёс быў у Карыньце, што Павал, прайшоўшы вышэйшыя краіны, прыйшоў
у Эфэс і, знайшоўшы некаторых вучняў,
2 сказаў да іх: «Ці прынялі вы Духа Сьвятога, паверыўшы?» Яны ж сказалі яму: «Але ж мы ня
чулі, ці ёсьць Сьвяты Дух».
3 І ён сказаў да іх: «Дык у што вы хрысьціліся?» Яны ж сказалі: «У хрышчэньне Янавае».
4 А Павал сказаў: «Ян хрысьціў хрышчэньнем навяртаньня, кажучы народу, каб верылі ў Таго,
Які ідзе за ім, значыць у Хрыста Ісуса».
5 Пачуўшы ж, яны былі ахрышчаныя ў імя Госпада Ісуса.
6 І, як усклаў Павал рукі на іх, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, і гаварылі мовамі, і прарочылі.
7 А было іх усіх каля дванаццаці мужоў.
8 Увайшоўшы ж у сынагогу, ён адважна гаварыў тры месяцы, ведучы гутаркі і пераконваючы
пра Валадарства Божае.
9 А як некаторыя закамянелі і ня верылі, праклінаючы гэты шлях перад мноствам, [Павал],
адыйшоўшы ад іх, аддзяліў вучняў, штодня ведучы гутаркі ў школе нейкага Тырана.
10 Дзеялася ж гэта два гады, так што чулі слова Госпада Ісуса ўсе жыхары Азіі, Юдэі і Грэкі.
11 І Бог чыніў незвычайныя цуды праз рукі Паўла,
12 так што хусткі ці паясы ад цела ягонага ўскладалі на нядужых, і пакідалі іх хваробы, і духі
злыя выходзілі з іх.
13 А некаторыя з вандроўных экзарцыстаў Юдэйскіх намагаліся над апанаванымі злымі духамі
называць імя Госпада Ісуса, кажучы: «Заклінаем вас Ісусам, Якога абвяшчае Павал».
14 Былі ж нейкія сямёра сыноў Скевы, першасьвятара Юдэйскага, якія рабілі гэта.

15 А злы дух, адказваючы, сказаў: «Ісуса ведаю, і Павал мне вядомы. А вы хто будзеце?»
16 І чалавек, у якім быў злы дух, кінуўшыся на іх і апанаваўшы іх, адолеў іх, так што яны голыя
і параненыя ўцяклі з таго дому.
17 Гэта сталася вядомым Юдэям і Грэкам, што жылі ў Эфэсе, і ахапіў страх іх усіх, і
ўзьвялічвалася імя Госпада Ісуса.
18 І многія з тых, што паверылі, прыходзілі, вызнаючы і апавядаючы ўчынкі свае,
19 і даволі з тых, што займаліся непатрэбнымі вучэньнямі, папрыносіўшы кнігі, спалілі перад
усімі, і палічылі кошт іхні, і знайшлі пяцьдзясят тысячаў срэбнікаў.
20 З гэткай моцай расло і крапчэла слова Госпада.
21 А калі гэта споўнілася, Павал палажыў у духу ісьці ў Ерусалім, прайшоўшы Македонію і
Ахаю, кажучы: «Пабыўшы там, мушу я і Рым убачыць».
22 Паслаўшы ж у Македонію двух служыцеляў сваіх, Цімафея і Эраста, сам застаўся часова ў
Азіі.
23 У гэты ж час сталася хваляваньне немалое з прычыны шляху [Госпада],
24 бо нейкі залатар, на імя Дэмэтры, што рабіў срэбныя бажніцы Артэміды і даваў майстрам
немалы заробак,
25 сабраўшы іх ды іншых працаўнікоў такога самага [рамяства], сказаў: «Мужы, вы ведаеце,
што з гэтае работы — наш дабрабыт.
26 І вы бачыце і чуеце, што ня толькі ў Эфэсе, але амаль у-ва ўсёй Азіі гэты Павал, пераканаўшы,
даволі народу адвярнуў, кажучы, што гэта ня богі, якія рукамі зробленыя.
27 А гэта ня толькі пагражае, што нашае рамяство прыйдзе ў заняпад, але і што сьвятыня
вялікае багіні Артэміды за нішто лічыцца будзе, і зьнішчыцца веліч тае, якой пакланяецца ўся
Азія і ўвесь сусьвет».
28 Пачуўшы ж [гэта] і напоўніўшыся ярасьцю, яны закрычалі, кажучы: «Вялікая Артэміда
Эфэская!»
29 І ўвесь горад напоўніўся ўзрушэньнем, і, падхапіўшы Гая і Арыстарха, Македонцаў,
спадарожнікаў Паўла, рынуліся аднадушна ў тэатар.
30 А калі Павал хацеў выйсьці да народу, вучні не дазволілі яму.
31 І некаторыя з начальнікаў Азійскіх, якія былі сябрамі ягонымі, паслаўшы да яго, прасілі не
ісьці ў тэатар.
32 Дык кожны крычаў нешта сваё, бо збор быў узрушаны, і большасьць ня ведала, дзеля чаго
сабраліся.
33 А з натоўпу паклікалі Аляксандра, якога выпхнулі Юдэі. Аляксандар жа, зрабіўшы знак
рукою, хацеў адказваць перад народам.
34 Калі ж даведаліся, што ён Юдэй, узьняўся крык у адзін голас, і крычалі каля дзьвюх гадзінаў:
«Вялікая Артэміда Эфэская!»
35 Пісар жа, суцішыўшы натоўп, кажа: «Мужы Эфэсцы! Які ж чалавек ня ведае, што горад Эфэс
ёсьць служыцелем вялікае багіні Артэміды і Дыяпэта?
36 А як гэта бясспрэчна, вы мусіце суцішыцца і нічога неразважна не рабіць.
37 Бо вы прывялі гэтых мужоў, якія ані сьвятыні не абакралі, і ня блюзьнілі супраць багіні
вашае.
38 Дык калі Дэмэтры і майстры, што з ім, маюць супраць некага слова, ёсьць суды і ёсьць
праконсулы, няхай адны адных абвінавачваюць.
39 А калі шукаеце нечага іншага, [няхай] будзе вырашана на законным зборы.
40 Бо мы ў небясьпецы быць абвінавачанымі ў паўстаньні дзеля сёньняшніх [падзеяў], ня
маючы ніякай прычыны, каб магчы даць справаздачу пра гэты сход».
41 І, сказаўшы гэта, распусьціў збор.

Дз 20

1 А калі сьціхла замяшаньне, Павал, паклікаўшы вучняў і разьвітаўшыся, пайшоў, каб ісьці ў
Македонію.

2 Прайшоўшы ж тыя краіны і многімі словамі падбадзёрыўшы іх, прыйшоў у Грэцыю.
3 І прабыўшы тры месяцы, калі сталася змова супраць яго ў Юдэяў, вырушыў у Сірыю, і
прыйшла яму думка вярнуцца праз Македонію.
4 А праводзілі яго да Азіі Сапатэр з Бэрэі, а з Тэсалонцаў — Арыстарх, і Сэкунд, і Гай з Дэрбы, і
Цімафей, а з Азійцаў — Тыхік і Трафім.
5 Яны, апярэдзіўшы, чакалі на нас у Траадзе.
6 А мы паплылі былі пасьля дзён праснакоў з Філіпаў і праз пяць дзён прыйшлі да іх у Трааду,
дзе былі сем дзён.
7 А ў першы дзень пасьля суботы, калі вучні сабраліся пераламіць хлеб, Павал вёў гутарку з
імі, маючы на заўтра выйсьці, і зацягнуў слова да паўночы.
8 Было ж даволі лямпаў у залі, дзе яны сабраліся.
9 А нейкі юнак, на імя Эўтых, які сядзеў на вакне і глыбока заснуў, як Павал доўга вёў гутарку,
зморaны ў сьне, упаў з трэцяга паверху ўніз і быў падняты мёртвы.
10 Павал жа, зыйшоўшы, упаў да яго і, абняўшы, сказаў: «Не хвалюйцеся, бо душа ягоная ў ім».
11 І, узыйшоўшы і пераламіўшы хлеб, і пакаштаваўшы, гутарыў даволі аж да сьвітаньня, і гэтак
пайшоў.
12 А хлопца таго прывялі жывога і ўсьцешыліся нямала.
13 А мы, пайшоўшы наперад да карабля, вырушылі ў Ас, маючы забраць адтуль Паўла, бо гэтак
ён загадаў, маючы сам ісьці пехатою.
14 Калі ж ён зыйшоўся з намі ў Асе, узяўшы яго, мы прыйшлі ў Мітылену.
15 Паплыўшы адтуль, мы назаўтра былі насупраць Хіёса, а на наступны дзень прысталі да
Самосу і, пабыўшы ў Трагільлі, наступнага дня прыйшлі ў Мілет,
16 бо Павал судзіў абмінуць Эфэс, каб не губляць часу ў Азіі, бо ён сьпяшаўся быць, калі
магчыма, у дзень Пяцідзясятніцы ў Ерусаліме.
17 А з Мілету, паслаўшы ў Эфэс, ён паклікаў старостаў царквы.
18 Калі ж яны прыйшлі да яго, ён сказаў ім: «Вы ведаеце, як я ад першага дня, у які прыйшоў у
Азію, увесь час быў з вамі,
19 служачы Госпаду з усёй пакораю і з многімі сьлязьмі і спакусамі, якія здараліся са мною ад
змоваў Юдэйскіх,
20 як не абмінуў я нічога карыснага, каб не абвясьціць вам і не навучаць вас перад грамадою і
па дамах,
21 сьведчачы і Юдэям, і Грэкам пра навяртаньне да Бога і пра веру ў Госпада нашага Ісуса
Хрыста.
22 І вось цяпер, зьвязаны Духам, іду я ў Ерусалім, ня ведаючы, што там сустрэне мяне,
23 адно Дух Сьвяты сьведчыць па гарадах, кажучы, што чакаюць мяне путы і прыгнёт.
24 Але я аніяк не зважаю на гэта і ня дбаю пра сваё жыцьцё, абы толькі ў радасьці скончыць бег
мой і служэньне, якое атрымаў ад Госпада Ісуса — сьведчыць пра Эвангельле ласкі Божае.
25 І цяпер вось ведаю, што больш ня ўгледзіце аблічча майго вы ўсе, сярод якіх я хадзіў,
абвяшчаючы Валадарства Божае.
26 Дзеля гэтага сьведчу вам у сёньняшні дзень, што я чысты ад крыві ўсіх,
27 бо не ўхіляўся абвяшчаць вам усю волю Божую.
28 Дык сьцеражыце самі сябе і ўвесь статак, у якім Дух Сьвяты паставіў вас за епіскапаў
пасьвіць царкву Божую, якую Ён здабыў уласнай крывёю.
29 Бо я ведаю, што пасьля адыходу майго прыйдуць да вас ваўкі лютыя, якія ня будуць
шкадаваць статак,
30 і спасярод вас саміх паўстануць людзі, якія будуць гаварыць сапсавана, каб пацягнуць
вучняў за сабою.
31 Дзеля гэтага чувайце, памятаючы, што я тры гады ўдзень і ўначы не пераставаў са сьлязьмі
настаўляць кожнага з вас.
32 І цяпер я аддаю вас, браты, Богу і слову ласкі Ягонае, што можа збудаваць і даць вам
спадчыну з усімі, хто асьвечаны.

33 Ані срэбра, ані золата, ані адзеньня я ні ад каго не жадаў.
34 Вы ж самі ведаеце, што ў патрэбах маіх і тых, што былі са мною, паслугавалі рукі гэтыя.
35 У-ва ўсім перасьцерагаў я вас, што, гэтак працуючы, мусім падтрымліваць нядужых і памятаць словы Госпада Ісуса, як Ён сказаў: “Шчасьлівей даваць, чым браць”».
36 І, сказаўшы гэтае і ўкленчыўшы, ён маліўся з імі ўсімі.
37 Стаўся ж вялікі плач ва ўсіх, і, кідаючыся на шыю яму, цалавалі яго,
38 сумуючы найбольш дзеля слова, якое ён сказаў, што ўжо больш ня будуць бачыць аблічча ягонага. І праводзілі яго да карабля.

Дз 21

1 Калі ж мы, пакінуўшы іх, паплылі, ідучы наўпрост, мы прыйшлі ў Кос, а на наступны дзень — у Радос, а адтуль — у Патару,
2 і, знайшоўшы карабель, які меў плыць у Фінікію, узыйшлі [на яго], і паплылі.
3 А ўбачыўшы Кіпр і пакінуўшы яго зьлева, мы плылі ў Сірыю і зыйшлі ў Тыры, бо там карабель меў разладаваць тавар.
4 І, знайшоўшы вучняў, мы былі там сем дзён, а тыя праз Духа казалі Паўлу, каб ён не ўзыходзіў у Ерусалім.
5 А калі мы пражылі тыя дні, выйшаўшы, мы пайшлі, і ўсе праводзілі нас з жонкамі і дзецьмі ажно за горад, і на беразе, укленчыўшы, маліліся.
6 І, разьвітаўшыся адны з аднымі, мы ўзыйшлі на карабель, а яны вярнуліся дадому.
7 А мы, скончыўшы плаваньне ад Тыру, прыйшлі ў Пталемаіду, і, прывітаўшы братоў, засталіся ў іх на адзін дзень.
8 А на заўтра тыя, што былі з Паўлам, пайшоўшы, прыйшлі ў Цэзарэю, і, увайшоўшы ў дом Філіпа дабравесьніка, аднаго з сямі, засталіся ў яго.
9 У яго ж былі чатыры дачкі дзяўчыны, якія прарочылі.
10 А як мы заставаліся шмат дзён, прыйшоў з Юдэі адзін прарок, на імя Агаў,
11 і, увайшоўшы да нас і ўзяўшы пояс Паўла, і зьвязаўшы сабе рукі і ногі, сказаў: «Гэтак кажа Дух Сьвяты: “Мужа, чый гэты пояс, так зьвяжуць Юдэі ў Ерусаліме і аддадуць у рукі паганаў”».
12 Калі ж мы пачулі гэта, і мы, і тамтэйшыя прасілі, каб ён не ўзыходзіў у Ерусалім.
13 А Павал адказаў: «Што вы робіце, плачучы і разрываючы маё сэрца? Бо я ня толькі гатовы быць зьвязаным, але і памерці ў Ерусаліме дзеля імя Госпада Ісуса».
14 І не пераканаўшы яго, мы супакоіліся, кажучы: «Няхай станецца воля Госпада!»
15 А пасьля гэтых дзён, узяўшы рэчы, мы ўзыходзілі ў Ерусалім.
16 Ішлі ж з намі і вучні з Цэзарэі, ведучы да нейкага Мназона, Кіпрыйца, старадаўняга вучня, у якога мы мелі гасьцяваць.
17 А як мы апынуліся ў Ерусаліме, браты прыхільна прынялі нас.
18 І на другі дзень увайшоў Павал разам з намі да Якуба; і прыйшлі ўсе старосты.
19 І, прывітаўшы іх, ён распавядаў падрабязна, што ўчыніў Бог сярод паганаў праз служэньне ягонае.
20 Яны ж, пачуўшы, праславілі Госпада і сказалі яму: «Бачыш, браце, колькі дзясяткаў тысячаў Юдэяў, якія паверылі, і ўсе яны рупліўцы Закону.
21 А яны начутыя адносна цябе, што ты вучыш адступніцтву ад Майсея ўсіх Юдэяў, што [жывуць] сярод паганаў, кажучы, каб не абрэзвалі сваіх дзяцей і не хадзілі паводле звычаяў.
22 Дык што гэта? Абавязкова мусіць сабрацца мноства, бо пачуюць, што ты прыйшоў.
23 Дык зрабі, што табе скажам. Ёсьць у нас чатыры мужы, якія маюць на сабе шлюбаваньне.
24 Узяўшы іх, ачысьціся разам з імі і выдаткуй за іх, каб яны абстрыглі галаву, і ўсе даведаюцца, што тое, што яны дачуліся адносна цябе, ёсьць пустое, але ты ходзіш адпаведна і захоўваеш Закон.
25 А адносна паганаў, якія паверылі, мы пісалі, пастанавіўшы, каб нічога гэткага не захоўвалі, а толькі высьцерагаліся ахвяраў ідалам, і крыві, і душанага, і распусты».

26 Тады Павал, узяўшы мужоў гэтых, на наступны дзень ачысьціўшыся з імі, увайшоў у сьвятыню, абвяшчаючы заканчэньне дзён ачышчэньня, калі за кожнага з іх прынесены будзе дар [Богу].
27 А калі меліся скончыцца сем дзён, Юдэі з Азіі, убачыўшы яго ў сьвятыні, узрушылі ўвесь натоўп і ўсклалі на яго рукі,
28 крычучы: «Мужы Ізраільцяне, дапамажыце! Гэта чалавек, які ўсіх паўсюль навучае супраць народу і супраць Закону, і супраць месца гэтага. Ды яшчэ Грэкаў увёў у сьвятыню і апаганіў гэтае месца сьвятое».
29 Бо яны раней бачылі з ім у горадзе Трафіма Эфэсца і думалі, што Павал увёў яго ў сьвятыню.
30 І ўвесь горад узварушыўся, і пазьбягаўся народ. І, узяўшы Паўла, пацягнулі яго вонкі са сьвятыні, і адразу дзьверы былі зачынены.
31 А калі шукалі забіць яго, да тысячніка кагорты дайшла вестка, што ўвесь Ерусалім узрушаны.
32 Ён, неадкладна ўзяўшы жаўнераў і сотнікаў, пабег на іх, а яны, убачыўшы тысячніка і жаўнераў, перасталі біць Паўла.
33 Тады, наблізіўшыся, тысячнік узяў яго і загадаў зьвязаць двума ланцугамі і пытаўся, хто ён і што зрабіў.
34 А ў натоўпе кожны крычаў нешта сваё. І ня могучы праз замяшаньне нешта пэўнае даведацца, загадаў весьці яго ў табар.
35 А калі [Павал] апынуўся ля сходаў, жаўнерам прыйшлося несьці яго на руках дзеля гвалту натоўпу,
36 бо мноства народу ішло за імі, крычучы: «Забі яго!»
37 І як меліся ўвайсьці ў табар, Павал кажа тысячніку: «Ці магу нешта сказаць табе?» Той жа сказаў: «Ты ведаеш грэцкую?
38 Дык ці ня ты той Эгіпцянін, які перад гэтымі днямі збунтаваў і вывеў у пустыню чатыры тысячы чалавек сікарыяў?»
39 А Павал сказаў: «Я — Юдэй з Тарсу, грамадзянін знакамітага гораду ў Кілікіі. Прашу ж цябе, дазволь мне гаварыць да народу».
40 Калі ж той дазволіў, Павал, стаўшы на сходах, даў знак народу рукою, і як сталася вялікая ціша, прамовіў на гебрайскай мове, кажучы:

Дз 22

1 «Мужы браты і бацькі! Паслухайце цяпер маю перад вамі абарону».
2 Пачуўшы, што ён прамовіў да іх на гебрайскай мове, яны больш замаўчалі і ён сказаў:
3 «Я сам Юдэй, народжаны ў Тарсе Кілікійскім, а ўзгадаваны ў горадзе гэтым ля ног Гамаліэля, старанна дысцыплінаваны ў Законе бацькоў, руплівец дзеля Бога, як і вы ўсе сёньня.
4 Я перасьледаваў шлях гэты ажно да сьмерці, зьвязваючы і аддаючы ў вязьніцу мужчынаў і жанчынаў,
5 як засьведчыць пра мяне і першасьвятар, і ўсе старшыні, ад якіх я, узяўшы пасланьні да братоў, пайшоў у Дамаск, каб і тых, якія там былі, прывесьці зьвязаных у Ерусалім дзеля пакараньня.
6 Сталася ж, калі я ішоў і набліжаўся да Дамаску, каля паўдня неспадзявана агарнула мяне вялікае сьвятло з неба.
7 І я ўпаў на зямлю, і пачуў голас, які гаварыў да мяне: “Саўле, Саўле, чаму ты перасьледуеш Мяне?”
8 А я адказаў: “Хто Ты, Госпадзе?” І Ён сказаў да мяне: “Я — Ісус з Назарэту, Якога ты перасьледуеш”.
9 Тыя ж, што былі са мною, бачылі сьвятло і перапалохаліся, а голасу Таго, Які гаварыў да мяне, ня чулі.
10 А я сказаў: “Што мне рабіць, Госпадзе?” Госпад жа сказаў да мяне: “Устаўшы, ідзі ў Дамаск, і там будзе табе сказана ўсё, што вызначана табе рабіць”.

11 А як ад славы сьвятла гэтага я ня бачыў, дык прыйшоў у Дамаск, ведзены за руку тымі, што
былі са мною.
12 А нейкі Ананія, муж пабожны паводле Закону, засьведчаны ўсімі тамтэйшымі Юдэямі,
13 прыйшоўшы да мяне і стаўшы, сказаў мне: “Саўле, браце! Глядзі!” І я ў тую ж гадзіну
ўгледзеў яго.
14 А ён сказаў: “Бог бацькоў нашых выбраў цябе, каб ты пазнаў волю Ягоную, і ўбачыў
Праведнага, і пачуў голас з вуснаў Ягоных,
15 бо ты будзеш сьведкам Яму перад усімі людзьмі пра тое, што ты бачыў і чуў.
16 І цяпер што ты марудзіш? Устаўшы, ахрысьціся і змый грахі твае, прызваўшы імя Госпада”.
17 Сталася ж, як я вярнуўся ў Ерусалім і маліўся ў сьвятыні, ахапіла мяне захапленьне
18 і я ўбачыў Яго, Які казаў да мяне: “Сьпяшайся і ідзі хутчэй з Ерусаліму, бо ня прымуць
сьведчаньня твайго пра Мяне”.
19 А я сказаў: “Госпадзе, яны ведаюць, што гэта я арыштоўваў і біў у сынагогах тых, якія вераць
у Цябе.
20 І калі пралівана была кроў Стэфана, сьведкі Твайго, і я быў [там], стоячы і згаджаючыся на
забойства яго, і пільнуючы адзеньне тых, што забівалі яго”.
21 І Ён сказаў да мяне: “Ідзі, бо Я да паганаў далёка пашлю цябе”».
22 А яны слухалі яго да гэтага слова, і ўзьнялі голас свой, кажучы: «Забяры з зямлі такога! Бо
не належыцца жыць яму!»
23 А як яны крычалі, і кідалі адзеньне, і пыл падкідалі ў паветра,
24 тысячнік загадаў весьці яго ў табар, сказаўшы тартураваць яго, каб даведацца, дзеля якое
віны гэтак крычалі на яго.
25 А калі расьцягнулі яго рамянямі, сказаў Павал да сотніка, які стаяў: «Ці ж можна вам
тартураваць Рымскага чалавека, і без суду?»
26 Пачуўшы ж гэта, сотнік, пайшоўшы, паведаміў тысячніку, кажучы: «Глядзі, што ты маеш
рабіць. Бо гэты чалавек — Рымлянін».
27 Падыйшоўшы, тысячнік сказаў яму: «Скажы мне, ці ты Рымлянін?» А ён прамовіў: «Так».
28 І адказаў тысячнік: «Я здабыў гэтае грамадзянства за вялікія грошы». А Павал прамовіў: «А
я нарадзіўся [ў ім]».
29 Дык адразу адступіліся ад яго тыя, што меліся тартураваць яго. І тысячнік спалохаўся,
даведаўшыся, што ён Рымлянін і што яны былі зьвязаўшы яго.
30 А назаўтра, хочучы даведацца напэўна, у чым абвінавачваюць яго Юдэі, зьняў з яго путы
і загадаў прыйсьці першасьвятарам і ўсяму сынэдрыёну іхняму, і, вывеўшы Паўла, паставіў
перад імі.

Дз 23

1 Павал, паўзіраўшыся на сынэдрыён, сказаў: «Мужы браты! Усім добрым сумленьнем я жыў
перад Богам да гэтага дня».
2 А першасьвятар Ананія загадаў тым, што стаялі пры ім, каб білі яго ў вусны.
3 Тады Павал сказаў яму: «Бог будзе біць цябе, сьцяна пабеленая! І ты сядзіш, судзячы мяне
паводле Закону, і насуперак Закону загадваеш мяне біць».
4 А тыя, што стаялі, сказалі: «Першасьвятара Божага зьневажаеш?»
5 І прамовіў Павал: «Ня ведаў я, браты, што ён першасьвятар. Бо напісана: “На начальніка
народу твайго не кажы блага”».
6 А, разумеючы, што адна частка — садукеі, а другая — фарысэі, закрычаў Павал у сынэдрыёне:
«Мужы браты! Я — фарысэй, сын фарысэя. За надзею і ўваскрасеньне мёртвых судзяць мяне!»
7 Калі ж ён гэтае сказаў, сталася спрэчка паміж фарысэямі і садукеямі, і разьдзялілася грамада,
8 бо садукеі кажуць, што няма ані ўваскрасеньня, ані анёла, ані духа; а фарысэі прызнаюць
адно і другое.

9 Узьняўся ж вялікі крык, і, устаўшы, кніжнікі фарысэйскае часткі спрачаліся, кажучы: «Нічога
благога мы не знаходзім у чалавеку гэтым. Ці дух гаварыў яму, ці анёл, не змагаймася з
Богам».
10 А калі спрэчка павялічылася, тысячнік, баючыся, каб яны не разарвалі Паўла, загадаў
жаўнерам, зыйшоўшы, узяць яго спасярод іх і весьці ў табар.
11 А ў наступную ноч Госпад, стаўшы перад ім, сказаў: «Будзь пэўны, Паўле! Бо як ты сьведчыў
пра Мяне ў Ерусаліме, гэтак мусіш сьведчыць і ў Рыме».
12 А як настаў дзень, некаторыя Юдэі, зрабіўшы сход, далі сабе клятву, кажучы, што ня будуць
ані есьці, ані піць, пакуль не заб'юць Паўла.
13 Было ж больш за сорак тых, што далі гэткі зарок.
14 Яны, прыйшоўшы да першасьвятароў і старшыняў, сказалі: «З праклёнам мы пакляліся
нічога ня есьці, пакуль не заб'ем Паўла.
15 Вы ж цяпер разам з сынэдрыёнам паведаміце тысячніку, каб заўтра ён вывеў яго да вас,
быццам маеце дакладней разгледзець адносна яго, а мы, перш, чым ён наблізіцца, гатовыя
забіць яго».
16 Пачуўшы ж пра гэтую змову, сын сястры Паўлавае, прыйшоўшы і ўвайшоўшы ў табар,
паведаміў Паўлу.
17 А Павал, паклікаўшы аднаго з сотнікаў, сказаў: «Завядзі гэтага дзецюка да тысячніка, бо ён
мае нешта паведаміць яму».
18 Дык той, узяўшы яго, прывёў да тысячніка і кажа: «Вязень Павал, паклікаўшы мяне, прасіў
прывесьці да цябе гэтага дзецюка, які мае нешта сказаць табе».
19 Тысячнік, узяўшы яго за руку і адыйшоўшыся на бок, спытаў: «Што такое маеш паведаміць
мне?»
20 А той сказаў: «Юдэі дамовіліся прасіць цябе, каб заўтра ты вывеў Паўла да сынэдрыёну,
быццам маючы нешта дакладней запытацца адносна яго.
21 Дык ты ня дай пераканаць цябе ім, бо на яго цікуюць больш за сорак мужоў з іх, якія далі
клятву ня есьці і ня піць, пакуль не заб'юць яго, і цяпер яны гатовыя, чакаючы абяцаньня ад
цябе».
22 Дык тысячнік адпусьціў дзецюка, загадаўшы: «Нікому не кажы, што мне пра гэтае
паведаміў».
23 І, паклікаўшы нейкіх двух сотнікаў, сказаў: «Падрыхтуйце дзьвесьце жаўнераў, і семдзясят
коньнікаў, і дзьвесьце драбаў, каб ісьці ў Цэзарэю а трэцяй гадзіне ночы.
24 І пастаўце жывёлу, каб, пасадзіўшы Паўла, завесьці здаровага да ваяводы Фэлікса».
25 І напісаў пасланьне гэткага зьместу:
26 «Кляўдый Лізій — вяльможнаму ваяводзе Фэліксу: радавацца!
27 Мужа гэтага, якога Юдэі схапілі і меліся забіць, я, стаўшы з войскам, вырваў, даведаўшыся,
што ён — Рымлянін.
28 А хочучы даведацца віну, дзеля чаго вінавацяць яго, я прывёў яго ў сынэдрыён іхні
29 і знайшоў, што яго вінавацяць дзеля спрэчак у Законе іхнім, а няма ніякага абвінавачваньня,
вартага сьмерці ці путаў.
30 А калі паведамілі мяне пра змову супраць мужа гэтага, што мелася ў Юдэяў, я неадкладна
паслаў [яго] да цябе, загадаўшы, каб тыя, што абвінавачваюць яго, гаварылі супраць яго перад
табою. Бывай здаровы».
31 Дык жаўнеры паводле загаданага ім, узяўшы Паўла, павялі ўначы ў Антыпатрыду,
32 а назаўтра, пакінуўшы коньнікаў ісьці з ім, вярнуліся ў табар.
33 Тыя, прыйшоўшы ў Цэзарэю і аддаўшы пасланьне ваяводзе, паставілі перад ім і Паўла.
34 А ваявода, прачытаўшы, спытаўся, з якое ён правінцыі, і, зразумеўшы, што з Кілікіі,
35 сказаў: «Я выслухаю цябе, калі зьявяцца і твае абвінавальнікі». І загадаў вартаваць яго ў
прэторыі Ірадавай.

Дз 24

1 А праз пяць дзён прыйшоў першасьвятар Ананія са старшынямі і нейкім рытарам Тэртулам,

якія выступілі перад ваяводам супраць Паўла.
2 А калі таго паклікалі, пачаў абвінавачваць яго Тэртул, гаворачы:
3 «Дазнаючы праз цябе вялікага супакою і дабрабыту, якія сталіся ў народзе гэтым праз тваю
апеку, заўсёды і паўсюль прыймаем мы гэта, вяльможны Фэліксе, з усёю ўдзячнасьцю.
4 А каб табе шмат не дакучаць, прашу цябе каротка выслухаць нас паводле спагаднасьці тваёй.
5 Бо, знайшоўшы, што муж гэты — пошасьць, будзіцель бунту сярод Юдэяў па ўсім сусьвеце і
правадыр герэзіі Назарэйскае,
6 які сьвятыню спакусіўся зьняважыць, мы затрымалі яго і хацелі судзіць паводле нашага
закону.
7 А тысячнік Лізій, прыйшоўшы, з вялікім гвалтам забраў яго з нашых рук,
8 загадаўшы абвінавальнікам ягоным ісьці да цябе. Ад яго ты сам можаш, дасьледаваўшы ўсё
гэта, даведацца, у чым мы вінавацім яго».
9 Пацьвердзілі і Юдэі, кажучы, што гэта так.
10 А Павал адказаў, калі ваявода даў яму знак гаварыць: «Ведаючы, што ты шмат год судзьдзя
гэтага народу, я ахвотней буду адказваць адносна [справы] маёй.
11 Ты можаш даведацца, што ня больш, як дванаццаць дзён прайшло, як узыйшоў я пакланіцца
ў Ерусалім.
12 І ані ў сьвятыні не знайшлі мяне, што я з некім вяду гутарку ці бунтую натоўп, ані ў
сынагогах, ані ў горадзе,
13 і яны ня могуць давесьці таго, у чым цяпер вінавацяць мяне.
14 Але прызнаюся табе, што паводле шляху, які яны герэзіяй называюць, я гэтак служу Богу
бацькоў, верачы ўсяму, што напісана ў Законе і ў Прарокаў,
15 маючы надзею на Бога, што мае быць уваскрасеньне мёртвых, праведных і няправедных,
чаго яны і самі чакаюць.
16 Дзеля гэтага я сам намагаюся мець заўсёды чыстае сумленьне перад Богам і перад людзьмі.
17 Праз шмат год я прыйшоў чыніць міласьціны для народу майго і дары.
18 Пры гэтым знайшлі мяне ачышчанага ў сьвятыні некаторыя Юдэі з Азіі, а не з натоўпам і не
з замяшаньнем.
19 Яны мусяць прыйсьці да цябе і абвінавачваць, калі нешта маюць супраць мяне.
20 Або самі гэтыя няхай скажуць, ці знайшлі ў-ва мне якую крыўду, калі я стаяў перад
сынэдрыёнам.
21 Ці адно тое слова, якое я крыкнуў, як стаяў сярод іх, што сёньня вы судзіце мяне за
ўваскрасеньне мёртвых».
22 Пачуўшы гэтае, Фэлікс адклаў [справу] іхнюю, сказаўшы: «Дакладней даведаўшыся пра
шлях гэты, як прыйдзе тысячнік Лізій, разгледжу [справу] вашую».
23 І загадаў сотніку пільнаваць Паўла, але даваць палёгку і не забараняць нікому з ягоных
служыць яму і прыходзіць да яго.
24 А праз некалькі дзён Фэлікс, прыйшоўшы з Друзілаю, жонкаю сваёй, якая была Юдэйкай,
паклікаў Паўла і слухаў яго пра веру ў Хрыста.
25 А як той вёў гутарку пра праведнасьць, і стрыманасьць, і пра будучы суд, Фэлікс,
спалохаўшыся, адказаў: «Цяпер годзе, ідзі, а як знайду час, паклічу цябе».
26 Пры гэтым ён, спадзеючыся, што атрымае грошы ад Паўла, каб звольніў яго, часта клічучы
яго, гутарыў з ім.
27 А як споўніліся два гады, Фэлікс атрымаў наступніка Порцыя Фэста, і, хочучы зрабіць ласку
Юдэям, Фэлікс пакінуў Паўла ўвязьненым.

Дз 25

1 Фэст, прыйшоўшы ў сваю правінцыю, праз тры дні ўзыйшоў з Цэзарэі ў Ерусалім.
2 А першасьвятары і першыя з Юдэяў выступілі перад ім супраць Паўла і малілі яго,
3 просячы ў яго ласкі, каб ён выклікаў [Паўла] ў Ерусалім, учыніўшы змову, каб забіць яго ў
дарозе.
4 Тады Фэст адказаў, што Паўла пільнуюць у Цэзарэі, а сам ён мае неўзабаве выйсьці [туды].

5 «Дык хто з вас можа, — кажа ён, — няхай ідуць [са мною], і, калі ёсьць нешта на чалавеку
гэтым, няхай яго вінавацяць».
6 А прабыўшы ў іх больш за дзесяць дзён, зыйшоў у Цэзарэю і на заўтра, сеўшы на судовым
пасадзе, загадаў прывесьці Паўла.
7 Калі ж той прыйшоў, абступілі яго Юдэі, якія прыйшлі з Ерусаліму, прыносячы супраць Паўла
шмат цяжкіх абвінавачваньняў, якіх не маглі давесьці.
8 Ён жа адказваў, што ні ў чым не саграшыў ані супраць Закону Юдэйскага, ані супраць
сьвятыні, ані супраць цэзара.
9 А Фэст, хочучы зрабіць ласку Юдэям, адказваючы Паўлу, сказаў: «Ці хочаш, узыйшоўшы ў
Ерусалім, там быць суджаны мною за гэта?»
10 А Павал сказаў: «Я стаю перад судовым пасадам цэзара, дзе я мушу быць суджаным. Юдэяў
нічым я ня скрыўдзіў, як і ты добра ведаеш.
11 Бо калі я зрабіў нейкую крыўду і нешта, вартае сьмерці, не адмаўляюся памерці; а калі няма
нічога, у чым яны мяне вінавацяць, ніхто ня можа выдаць ім мяне. Прызываю [суд] цэзара!»
12 Тады Фэст, пагутарыўшы з радаю, адказаў: «Прызываеш цэзара? Да цэзара пойдзеш».
13 А калі мінула некалькі дзён, валадар Агрыпа і Бэрніка прыйшлі ў Цэзарэю прывітаць Фэста.
14 Калі ж былі яны там шмат дзён, Фэст прадставіў валадару справу Паўла, кажучы: «Ёсьць
нейкі чалавек, пакінуты Фэліксам як вязень,
15 супраць якога, калі я быў у Ерусаліме, выступалі першасьвятары і старшыні юдэйскія,
просячы прысуду на яго.
16 Я адказаў ім, што ў Рымлянаў няма звычаю выдаваць нейкага чалавека на сьмерць перш,
чым вінавачаны будзе мець перад абліччам [сваім] абвінавальнікаў і атрымае месца дзеля
абароны ад абвінавачваньня.
17 Дык калі яны зыйшліся, я, ня робячы аніякай затрымкі, на другі дзень, сеўшы на судовы
пасад, загадаў прывесьці гэтага чалавека.
18 Абвінавальнікі, абступіўшы яго, не прынесьлі супраць яго аніякае віны, якой я спадзяваўся,
19 а мелі яны з ім нейкія спрэчкі пра іхнюю рэлігію і пра нейкага памёршага Ісуса, пра Якога
Павал цьвердзіў, што Ён жывы.
20 Зьбянтэжаны гэтай спрэчкаю, я сказаў, ці хоча ён ісьці ў Ерусалім і там быць суджаным за
гэта.
21 А як Павал запатрабаваў, каб яго пільнавалі дзеля разгляду Аўгуста, я загадаў пільнаваць
яго, пакуль не пашлю яго да цэзара».
22 Агрыпа ж мовіў да Фэста: «Хацеў бы і я сам пачуць гэтага чалавека». А той кажа: «Заўтра
пачуеш яго».
23 Дык на заўтра, калі Агрыпа і Бэрніка прыйшлі з вялікай пышнасьцю і ўвайшлі ў судовую
залю разам з тысячнікамі і найпаважнейшымі мужамі гораду, на загад Фэста быў прыведзены
Павал.
24 І прамовіў Фэст: «Валадару Агрыпа і ўсе прысутныя з намі мужы! Вы бачыце таго, адносна
якога ўсё мноства Юдэйскае прасіла мяне і ў Ерусаліме, і тут, крычучы, што не належыцца
яму больш жыць.
25 Але я не спасьцярог, каб ён зрабіў нешта вартае сьмерці, і як ён сам прызваў Аўгуста, я судзіў
паслаць яго.
26 Ды ня маю нічога пэўнага напісаць гаспадару. Дзеля гэтага прывёў яго да вас, і асабліва да
цябе, валадару Агрыпа, каб, учыніўшы допыт, я меў, што напісаць.
27 Бо неразумным здаецца мне, пасылаючы вязьня, нават не пазначыць абвінавачваньня
супраць яго».

Дз 26

1 Агрыпа ж прамовіў да Паўла: «Дазваляецца табе гаварыць за сябе». Тады Павал, выцягнуўшы
руку, адказаў:
2 «Валадару Агрыпа, я ўважаю сябе шчасьлівым, маючы сёньня адказваць перад табою адносна
ўсяго, што закідаюць мне Юдэі,

3 тым больш, што ты знаўца ўсіх звычаяў Юдэйскіх і спрэчак. Дзеля гэтага прашу цябе
выслухаць мяне доўгацярпліва.
4 Дык вось, усё жыцьцё маё ад юнацтва, якое ад пачатку праходзіла сярод народу майго ў
Ерусаліме, ведаюць усе Юдэі.
5 Ведаючы мяне раней, калі захочуць, засьведчаць, што я жыў як фарысэй паводле
найдасканалейшага накірунку набажэнства нашага.
6 І цяпер я стаю, як падсудны, за надзею на абяцаньне, дадзенае бацькам нашым ад Бога,
7 асягнуць якое спадзяюцца дванаццаць каленаў нашых, служачы ўночы і ўдзень безупынна.
За гэтую надзею і абвінавачваюць мяне Юдэі, валадару Агрыпа!
8 Што? Вы судзіце, што неверагодна, каб Бог уваскрашаў мёртвых?
9 Дык і я думаў у сабе, што я мушу шмат зрабіць супраць імя Ісуса з Назарэту,
10 што і рабіў у Ерусаліме, і, узяўшы ўладу ад першасьвятароў, я шмат сьвятых замыкаў у
вязьніцу, і як іх забівалі, я даваў голас.
11 І па ўсіх сынагогах, шмат караючы іх, я прымушаў іх блюзьніць, і, яшчэ больш разьярыўшыся
супраць іх, перасьледаваў нават і ў чужых гарадах.
12 І з гэтым ідучы ў Дамаск, з уладаю і дазволам ад першасьвятароў,
13 пасярод дня, валадару, убачыў я на шляху сьвятло з неба, ярчэйшае за зьзяньне сонца, якое
асьвяціла мяне і тых, што ішлі са мной.
14 А калі ўсе мы ўпалі на зямлю, я пачуў голас, які гаварыў да мяне і казаў на гебрайскай мове:
“Саўле, Саўле, чаму ты перасьледуеш Мяне? Цяжка табе супраць ражна ўпірацца”.
15 А я сказаў: “Хто Ты, Госпадзе?” Ён жа сказаў: “Я — Ісус, Якога ты перасьледуеш;
16 але паўстань і стань на ногі твае, бо Я дзеля таго зьявіўся табе, каб выбраць цябе паслугачом
і сьведкам таго, што ты бачыў і што Я зьяўлю табе,
17 вырываючы цябе з народу гэтага і паганаў, да якіх цяпер пасылаю цябе,
18 каб адчыніць вочы іхнія, зьвярнуць ад цемры да сьвятла і ад улады шатана да Бога, каб праз
веру ў Мяне атрымалі адпушчэньне грахоў і жэрабя сярод асьвечаных”.
19 Адгэтуль, валадару Агрыпа, я ня быў непаслухмяным відзежу нябеснаму,
20 але абвяшчаў спачатку жыхарам Дамаску і Ерусаліму, а пасьля ўсёй краіны Юдэйскай і
паганам, каб навярнуліся і зьвярнуліся да Бога, робячы ўчынкі, вартыя навяртаньня.
21 За гэта Юдэі спрабавалі забіць мяне, схапіўшы ў сьвятыні.
22 Але я, атрымаўшы дапамогу ад Бога, да гэтага дня стаю, сьведчачы малому і вялікаму, нічога
звыш ня кажучы, як што гаварылі Прарокі і Майсей, што мае стацца:
23 што Хрыстос мае пакутаваць і, як Першы з уваскрасеньня мёртвых, мае прапаведаваць
сьвятло народу [гэтаму] і паганам».
24 А калі ён гэтак адказваў, прамовіў Фэст моцным голасам: «Ты вар’яцееш, Павал! Вялікая
вучонасьць даводзіць цябе да шаленства».
25 А той кажа: «Не вар’яцею, вяльможны Фэсьце, але прамаўляю словы праўды і здаровага
розуму,
26 бо разумее гэта валадар, перад якім я гавару адважна, бо перакананы, што нішто з гэтага
перад ім ня ўтоілася, бо нічога з гэтага ў закуцьці ня дзеялася.
27 Ці верыш ты Прарокам, валадару Агрыпа? Ведаю, што верыш».
28 Агрыпа ж прамовіў да Паўла: «Ты мала не пераканаў мяне стацца Хрысьціянінам!»
29 А Павал сказаў: «Маліў бы я Бога, каб памалу ці памногу, ня толькі ты, але і ўсе, што
слухаюць мяне сёньня, сталіся такімі, як і я, акрамя гэтых путаў».
30 І калі сказаў ён гэтае, устаў валадар, і ваявода, і Бэрніка, і тыя, што з імі сядзелі,
31 і, адыйшоўшыся ў бок, гаварылі паміж сабою, кажучы, што нічога, вартага сьмерці або путаў
ня робіць чалавек гэты.
32 А Агрыпа сказаў Фэсту: «Можна было вызваліць гэтага чалавека, калі б ён не прызваў
цэзара».

Дз 27

1 А калі прысудзілі нам плыць у Італію, Паўла і некаторых іншых вязьняў аддалі сотніку з
кагорты Аўгуста, на імя Юлій.
2 Узыйшоўшы ж на Адраміцкі карабель, які меў плысьці ўздоўж месцаў Азійскіх, мы вырушылі,
маючы з сабой Арыстарха, Македонца з Тэсалонік,
3 і на другі дзень прысталі да Сідону. І Юлій, які абыходзіўся з Паўлам па-людзку, дазволіў яму
пайсьці да сяброў і атрымаць адпачынак.
4 Вырушыўшы адтуль, мы прыплылі да Кіпру, бо вятры былі супраціўныя.
5 І пераплыўшы мора насупраць Кілікіі і Памфіліі, мы зыйшлі ў Мірах Лікійскіх.
6 Там сотнік, знайшоўшы Александрыйскі карабель, які плыў у Італію, пасадзіў нас на яго.
7 Плывучы ж памалу даволі дзён і ледзь апынуўшыся насупраць Кніду, бо вецер не дазваляў
нам, прыплылі мы да Крыту насупраць Сальмону.
8 І, ледзьве праплыўшы паўз яго, мы прыйшлі да нейкага месца, называнага Добрыя Затокі, ад
якога блізка горад Лясэя.
9 А калі мінула даволі часу, і плаваньне было ўжо небясьпечнае, бо ўжо і пост прамінуў, радзіў
Павал,
10 кажучы ім: «Мужы! Я бачу, што плаваньне мае быць са шкодаю і многімі стратамі ня толькі
для ладунку і карабля, але і для душаў нашых».
11 А сотнік больш даверыўся корніку і гаспадару карабля, чым таму, што казаў Павал.
12 А як затока не была прыстасаваная для зімаваньня, большасьць давала параду плысьці
адтуль, каб можна было перазімаваць, дабраўшыся да Фініку, Крыцкае затокі, што ляжыць
насупраць паўднёва-заходняга і паўночна-заходняга ветру.
13 Калі ж павеяў паўднёвы вецер, яны, думаючы, што атрымалі жаданае, выправіўшыся,
паплылі паўз Крыт.
14 Неўзабаве наляцеў бурны вецер, называны Эўраклідон.
15 А калі карабель падхапіла і ён ня мог працівіцца ветру, мы здаліся, і нас панесла.
16 Наляцеўшы ж на нейкую выспачку, называную Кляўда, мы ледзь здолелі ўтрымаць човен.
17 Падняўшы яго, узяліся за помачы, абвязваючы карабель, і, баючыся, каб ня быць выкінутымі
на мялізну, спусьцілі ветразь і гэтак насіліся.
18 А як бура крэпка кідала нас, на другі дзень выкінулі тавары,
19 а на трэці дзень мы сваімі рукамі павыкідалі карабельны рыштунак.
20 А калі шмат дзён не сьвяціла ані сонца, ані зоркі, і немалая бура налягала, нарэшце прапала
ўсякая надзея, каб нам выратавацца.
21 А як мы доўга былі няеўшы, Павал, стаўшы пасярод, сказаў: «Мужы, трэба было,
паслухаўшыся мяне, ня плысьці ад Крыту і пазьбегнуць гэтае шкоды і страты.
22 І цяпер раджу вам, падбадзёрцеся, бо ня будзе згубленая ніводная душа сярод вас, акрамя
карабля.
23 Бо стаў перада мною ў гэтую ноч анёл Бога, Якому я прыналежу і Якому служу,
24 і сказаў: “Ня бойся, Паўле! Ты мусіш стаць перад цэзарам, і вось, Бог дараваў табе ўсіх, што
плывуць з табою”.
25 Дзеля гэтага падбадзёрцеся, мужы, бо я веру Богу, што будзе паводле таго, як мне было
сказана,
26 і мы мусім быць выкінутыя на нейкі востраў».
27 А як настала чатырнаццатая ноч, што нас насіла па Адрыятыцы, каля сярэдзіны ночы маракі
сталі спадзявацца, што падыходзім да нейкае зямлі.
28 І, памераўшы, знайшлі дваццаць сажняў. А крыху адплыўшы і зноў памераўшы, знайшлі
пятнаццаць сажняў.
29 І, баючыся, каб ня быць выкінутымі на скалістыя месцы, скінуўшы з карна чатыры якары,
чакалі дня.
30 А калі маракі шукалі, каб уцячы з карабля, і спускалі ў мора човен, паказваючы, быццам
маюць скінуць якары з носу,

31 Павал сказаў сотніку і жаўнерам: «Калі яны не застануцца на караблі, вы ня зможаце
збавіцца».
32 Тады жаўнеры паабсякалі вяроўкі ад чаўна і далі яму ўпасьці.
33 А перад настаньнем дня Павал прасіў усіх прыняць ежу, кажучы: «Сёньня чатырнаццаты
дзень, як вы, чакаючы, застаяцёся ня еўшы і нічога не прыймаючы.
34 Дзеля гэтага прашу вас прыняць ежу, бо гэта будзе дзеля вашага выратаваньня, бо нікому з
вас волас з галавы не ўпадзе».
35 А сказаўшы гэта і ўзяўшы хлеб, ён падзякаваў Богу перад усімі і, пераламіўшы, пачаў есьці.
36 І ўсе, падбадзёрыўшыся, прынялі ежу.
37 Было ж усіх на караблі дзьвесьце семдзясят шэсьць душ.
38 Насыціўшыся ежай, мы палегчылі карабель, выкідаючы пшаніцу ў мора.
39 А як настаў дзень, не пазналі зямлі, але ўгледзелі нейкую затоку, якая мела бераг, да якога
пастанавілі, калі магчыма, прыстаць з караблём.
40 І, адкінуўшы якары, пайшлі па моры, і, адвязаўшы стырно і наставіўшы жагель па ветры,
кіраваліся да берагу.
41 А натрапіўшы на касу, карабель сеў на мялізну, і нос, завязшы, заставаўся нерухомы, а карно
разьбівалася сілаю хваляў.
42 Жаўнеры зрабілі пастанову, каб вязьняў пазабіваць, каб хто, выплыўшы, ня ўцёк.
43 Сотнік жа, хочучы ўратаваць Паўла, забараніў іхнюю пастанову і загадаў тым, якія могуць
плаваць, скочыўшы першымі, выйсьці на зямлю,
44 а рэшце [плысьці] каму на дошках, каму на чым іншым з карабля. І гэтак сталася, што ўсе
ўратаваліся на зямлю.

Дз 28

1 Тады, уратаваўшыся, мы даведаліся, што востраў называецца Мэліта.
2 Барбары ж зьявілі нам незвычайную людзкасьць, бо, распаліўшы агонь, прынялі нас усіх, бо
быў дождж і сьцюжа.
3 А калі Павал набраў мноства ламачча і клаў на агонь, яхідна, выйшаўшы ад жару,
прычапілася да рукі ягонай.
4 Калі ж барбары ўбачылі зьвера, які вісеў на руцэ ягонай, гаварылі між сабою: «Напэўна,
чалавек гэты забойца, якому, уратаванаму ад мора, прысуд жыць не дазваляе».
5 А ён, абтросшы зьвера ў агонь, не дазнаў аніякага ліха.
6 Яны ж чакалі, што ён стане пухнуць ці раптам упадзе мёртвы. А доўга чакаючы і бачачы, што
нічога благога з ім ня сталася, зьмянілі думку і казалі, што ён — бог.
7 А ў тым месцы былі палі першага [чалавека] вострава, на імя Публій, які, прыняўшы нас, тры
дні прыязна гасьцяваў.
8 Сталася ж, што бацька Публія ляжаў, хворы на гарачку і крываўку. Павал, увайшоўшы да яго
і памаліўшыся, усклаў на яго рукі і аздаравіў яго.
9 Калі ж гэта сталася, і іншыя хворыя на востраве прыходзілі, і былі аздароўленыя.
10 І яны ўшанавалі нас шанаваньнем вялікім, і, як мы адплывалі, далі, што было патрэбна.
11 А праз тры месяцы паплылі мы на Александрыйскім караблі са знакам Дыяскуры, які
зімаваў на востраве,
12 і, прыстаўшы ў Сіракузах, заставаліся [там] тры дні.
13 Адтуль, плывучы ўздоўж [берагу], прыйшлі мы ў Рэгію; і, як праз адзін дзень узьняўся
паўднёвы вецер, на другі дзень прыйшлі ў Путэолі,
14 дзе, знайшоўшы братоў, былі запрошаныя імі застацца на сем дзён; і гэтак прыйшлі ў Рым.
15 Тамтэйшыя браты, пачуўшы пра нас, павыходзілі нам насустрач аж да Апіявае плошчы і
Трох Корчмаў. Убачыўшы іх, Павал падзякаваў Богу і набраўся адвагі.
16 Калі ж мы прыйшлі ў Рым, сотнік перадаў вязьняў гетману, а Паўлу было дазволена жыць
асобна з жаўнерам, які яго вартаваў.

17 Сталася ж, што праз тры дні Павал склікаў першых з Юдэяў, і калі яны зыйшліся, сказаў да
іх: «Мужы браты! Нічога не зрабіўшы супраць народу ці звычаяў бацькоўскіх, я выдадзены як
вязень з Ерусаліму ў рукі Рымлянаў.
18 Яны, дапытаўшы мяне, хацелі вызваліць, бо ніякае сьмяротнай віны на мне не было.
19 А як Юдэі працівіліся, я быў змушаны прызваць [суд] цэзара, але не таму, што меўся ў чым
вінаваціць народ мой.
20 Дзеля гэтае прычыны я запрасіў вас, каб пабачыць і паразмаўляць. Бо за надзею Ізраіля я
закаваны ў ланцугі гэтыя».
21 Яны ж сказалі да яго: «Мы ані лістоў адносна цябе не атрымалі з Юдэі, ані ніхто з братоў,
што прыходзілі, не абвяшчаў і не гаварыў пра цябе нічога злога.
22 Лічым жа вартым пачуць ад цябе, як ты думаеш, бо пра герэзію гэтую вядома нам, што
ўсюды ёй працівяцца».
23 Вызначыўшы ж яму дзень, большасьць прыйшла да яго ў гасподу. І ён з ранку да вечара
выкладаў ім, сьведчачы пра Валадарства Божае і пераконваючы іх пра Ісуса з Закону Майсея і
Прарокаў.
24 І адны былі перакананыя сказаным, а другія ня верылі.
25 І, не згаджаючыся між сабою, яны пайшлі, калі Павал сказаў адно слова: «Добра сказаў да
бацькоў нашых Дух Сьвяты праз прарока Ісаю, кажучы:
26 “Ідзі да народу гэтага і скажы: ‘Слыхам пачуеце, і не зразумееце; і, гледзячы, глядзець
будзеце, і ня ўбачыце,
27 бо атлусьцела сэрца народу гэтага, і вушамі з цяжкасьцю чуюць, і вочы свае заплюшчылі, каб
ня ўбачылі вачыма і не пачулі вушамі, і не зразумелі сэрцам, і не навярнуліся, каб Я аздаравіў
іх’.”
28 Дык няхай будзе вам вядома, што паганам паслана збаўленьне Божае, яны і пачуюць».
29 І, як ён гэта сказаў, Юдэі выйшлі, маючы між сабою шмат спрэчак.
30 А Павал цэлыя два гады заставаўся ў сваёй нанятай кватэры і прыймаў усіх, якія прыходзілі
да яго,
31 абвяшчаючы Валадарства Божае і навучаючы пра Госпада Ісуса Хрыста з усёй адвагаю без
перашкоды.

ПАСЛАНЬНЕ ДА РЫМЛЯНАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, слуга Ісуса Хрыста, пакліканы апостал, аддзелены дзеля Эвангельля Божага,
2 якое [Бог] раней абяцаў праз прарокаў Сваіх у сьвятых Пісаньнях,
3 пра Сына Ягонага, Які паводле цела стаўся з насеньня Давіда,
4 і аб'явіўся як Сын Божы ў моцы паводле духа сьвятасьці праз уваскрасеньне з мёртвых, пра Ісуса Хрыста, Госпада нашага,
5 праз Якога мы атрымалі ласку і апостальства на паслухмянасьць веры ў-ва ўсіх народах, дзеля імя Ягонага,
6 сярод якіх і вы, пакліканыя Ісусам Хрыстом, —
7 усім, якія ёсьць у Рыме, улюбёным Бога, пакліканым сьвятым: ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
8 Найперш дзякую Богу майму праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца ў-ва ўсім сьвеце.
9 Бо сьведка мне Бог, Якому служу духам маім у Эвангельлі Сына Яго, што несупынна ўзгадваю вас,
10 заўсёды просячы ў малітвах маіх, каб некалі ўжо давялося мне з волі Божае прыйсьці да вас.
11 Бо я жадаю бачыць вас, каб даць вам нейкі дар духоўны дзеля ўмацаваньня вашага,
12 гэта значыць, суцешыцца супольна з вамі вераю адзін аднаго, вашаю і маёю.
13 Не хачу, браты, каб вы ня ведалі, што я часта пастанаўляў прыйсьці да вас, каб мець нейкі плод і ў вас, як і ў іншых народах, і забаронена мне было аж дагэтуль.
14 Я вінаваты і Грэкам, і барбарам, і мудрым, і бяздумным.
15 Дык што да мяне, я гатовы дабравесьціць і вам, якія ў Рыме.
16 Бо я не саромлюся Эвангельля Хрыстовага, бо яно ёсьць моц Божая на збаўленьне кожнаму, хто верыць, перш Юдэю, і Грэку.
17 Бо ў ім адкрываецца праведнасьць Божая ад веры ў веру, як напісана: «А праведны з веры жыць будзе».
18 Бо адкрываецца гнеў Божы з неба на ўсякую бязбожнасьць і няправеднасьць людзей, якія праз няправеднасьць праўду стрымліваюць.
19 Бо, што магчыма ведаць пра Бога, яўна для іх, бо Бог выявіў ім.
20 Бо нябачнае Яго, і вечная моц Яго, і Боскасьць ад стварэньня сьвету відочныя праз разважаньне пра творы [Ягоныя], каб быць ім без апраўданьня.
21 Бо яны, пазнаўшы Бога, ня славілі [Яго] як Бога і ня дзякавалі, але займаліся марнасьцю ў думках сваіх, і зацемрылася няцямкае сэрца іхняе.
22 Цьвердзячы пра сябе, што мудрыя, яны здурнелі
23 і славу незьнішчальнага Бога замянілі на падабенства вобразу зьнішчальнага чалавека, і птушак, і чатырохногіх, і паўзуноў.
24 Дзеля гэтага і аддаў іх Бог у пажаданьнях сэрцаў іхніх нячыстасьці зьневажаць целы свае між сабою.
25 Яны замянілі праўду Божую на хлусьню, і пакланяліся, і служылі стварэньню замест Таго, Які стварыў, Які дабраслаўлёны на вякі. Амэн.
26 Дзеля гэтага аддаў іх Бог у ганебныя жарсьці, бо жанчыны іхнія замянілі прыродныя зносіны на супрацьпрыродныя.
27 Падобна і мужчыны, пакінуўшы прыродныя зносіны з жанчынамі, распаляліся ў пажадлівасьці сваёй адзін да аднаго, мужчыны з мужчынамі непрыстойнасьць робячы і атрымліваючы ў саміх сабе належную адплату за свой падман.
28 І, як яны не спрабавалі мець пазнаньне Бога, аддаў іх Бог няздатнаму розуму рабіць, што не належыць,
29 напоўненыя ўсякай няправеднасьцю, распустаю, зласьлівасьцю, хцівасьцю, ліхотаю, поўныя зайздрасьці, забойства, сваркі, подступу, благіх звычаяў,

30 абмоўнікі, паклёпнікі, боганенавісьнікі, крыўдзіцелі, ганарыстыя, пыхліўцы, выдумшчыкі
ліхога, непаслухмяныя бацькам,
31 няцямкія, нязгодлівыя, бязьлітасныя, няўмольныя, неміласэрныя.
32 Яны, пазнаўшы пастанову Божую, што тыя, хто гэткае ўчыняе, вартыя сьмерці, ня толькі
гэтае робяць, але і ўхваляюць тых, хто робіць [гэтае].

Рым 2

1 Дзеля гэтага няма апраўданьня табе, кожны чалавек, які судзіш; бо ў чым ты судзіш іншага,
асуджаеш сябе, бо робіш тое самае, судзячы.
2 А мы ведаем, што суд Божы ёсьць паводле праўды адносна тых, што гэткае ўчыняюць.
3 Няўжо ж ты думаеш, чалавек, які судзіш тых, што гэткае ўчыняюць, і сам робіш тое самае,
што ўцячэш ад суду Божага?
4 Або багацьцем ласкавасьці Ягонай, і цярплівасьці, і доўгацярплівасьці пагарджаеш, ня
ведаючы, што добрасьць Божая вядзе цябе да навяртаньня?
5 Але праз упартасьць тваю і ненавернутае сэрца ты зьбіраеш сабе гнеў на дзень гневу і
адкрыцьця праведнага суду Божага,
6 Які аддасьць кожнаму паводле ўчынкаў ягоных:
7 тым, якія цярплівасьцю ў добрай справе шукаюць славы, пашаны і незьнішчальнасьці, —
жыцьцё вечнае,
8 а тым, што спрачаюцца і не скараюцца праўдзе, але скараюцца няправеднасьці, — ярасьць і
гнеў.
9 Прыгнёт і ўціск кожнай душы чалавека, які робіць ліхое, перш Юдэя, і Грэка!
10 Слава, і пашана, і супакой усякаму, хто робіць добрае, перш Юдэю, і Грэку!
11 Бо няма ў Бога ўзіраньня на аблічча.
12 Бо тыя, якія без Закону зграшылі, без Закону і загінуць, а тыя, якія ў Законе зграшылі, праз
Закон будуць асуджаныя.
13 Бо не слухачы Закону праведныя перад Богам, але выканаўцы Закону будуць апраўданыя.
14 Бо калі пагане, якія ня маюць Закону, паводле прыроды робяць паводле Закону, яны, ня
маючы Закону, самі сабе Закон.
15 Яны зьяўляюць справы Закону, якія напісаныя ў сэрцах іхніх, пра што сьведчыць сумленьне
іхняе і думкі іхнія, якія то абвінавачваюць, то апраўдваюць адна адну,
16 у дзень, калі Бог будзе судзіць тайныя [ўчынкі] людзей, паводле Эвангельля майго, праз
Ісуса Хрыста.
17 Вось, ты завешся Юдэем, і супакойваеш сябе Законам, і хвалішся Богам,
18 і ведаеш волю [Ягоную], і выпрабоўваеш, што лепшае, будучы навучаным у Законе.
19 І ты перакананы пра сябе, што ты — павадыр сьляпых, сьвятло тых, што ў цемры,
20 выхавацель неразумных, настаўнік немаўлят, які мае ў Законе выгляд веданьня і праўды.
21 Дык ты, вучачы другога, ня вучыш сябе самога.
22 Абвяшчаючы ня красьці, крадзеш; кажучы не чужаложыць, чужаложыш, брыдзячыся
ідаламі, чыніш сьвятакрадзтва.
23 Ты, які хвалішся Законам, праз парушэньне Закону Бога зьневажаеш.
24 Бо праз вас на імя Божае блюзьніцца ў паганаў, як напісана.
25 Бо абразаньне карыснае, калі выконваеш Закон; а калі ты парушальнік Закону, абразаньне
тваё сталася неабразаньнем.
26 Дык калі неабрэзаны захоўвае пастановы Закону, ці не залічыцца яму ягонае неабразаньне
за абразаньне?
27 І неабрэзаны паводле прыроды, які спаўняе Закон, будзе судзіць цябе, парушальніка Закону,
які з літарай і абразаньнем.
28 Бо ня той Юдэй, хто гэтакі яўна, і ня тое абразаньне, якое яўнае на целе,
29 але хто ва ўтоенасьці Юдэй, і [ў якога] абразаньне сэрца Духам, а ня літарай, такому пахвала
не ад людзей, але ад Бога.

Рым 3

1 Дык якая перавага Юдэя, ці якая карысьць ад абразаньня?
2 Вялікая ў-ва ўсіх адносінах, а найперш у тым, што ім даверана слова Божае.
3 Бо што, калі некаторыя не паверылі? Ці недаверства іхняе зьнішчыць веру Божую?
4 Няхай ня станецца! Бог ёсьць праўдзівы, а ўсякі чалавек хлусьлівы, як напісана: «Каб Ты быў праведны ў словах Тваіх і перамог у судзе Тваім».
5 А калі нашая няправеднасьць зьяўляе праведнасьць Божую, што скажам? Ці Бог, Які выяўляе гнеў, няправедны? Кажу па-чалавечаму.
6 Няхай ня станецца! Бо як жа Бог будзе судзіць сьвет?
7 Бо калі праўда Божая праз маю хлусьлівасьць памнажаецца на славу Ягоную, за што яшчэ мяне судзяць як грэшніка?
8 І ці не рабіць нам благое, каб выйшла добрае, як некаторыя блюзьняць на нас і кажуць, што мы гэтак кажам? Справядлівы суд на такіх!
9 Дык што? Ці мы лепшыя? Зусім не! Бо мы ўжо давялі, што і Юдэі, і Грэкі, — усе пад грэхам,
10 як напісана: «Няма праведнага аніводнага;
11 няма таго, хто разумее; няма таго, хто шукае Бога.
12 Усе ўхіліліся, разам нягодныя; няма таго, хто робіць дабро, няма аніводнага.
13 Горла іхняе — магіла адчыненая; языкамі сваімі ашукваюць, атрута зьмяіная на губах іхніх.
14 Вусны іхнія поўныя абмовы і горычы.
15 Ногі іхнія хуткія на праліцьцё крыві,
16 зьнішчэньне і няшчасьце на шляхах іхніх,
17 і шляху супакою яны не пазналі.
18 Няма страху Божага перад вачыма іхнімі».
19 А мы ведаем, што Закон усё, што гаворыць, гаворыць да тых, якія пад Законам, каб усе вусны былі загароджаныя і ўвесь сьвет стаўся вінаватым перад Богам,
20 бо справамі Закону не апраўдаецца перад Ім ніякае цела; бо праз Закон пазнаецца грэх.
21 А цяпер, незалежна ад Закону, зьяўлена праведнасьць Божая, засьведчаная праз Закон і Прарокаў,
22 праведнасьць Божая праз веру ў Ісуса Хрыста для ўсіх і на ўсіх тых, якія вераць; бо няма розьніцы,
23 бо ўсе зграшылі і пазбаўлены славы Божае,
24 атрымліваючы апраўданьне дарма ласкай Ягонай праз адкупленьне ў Хрысьце Ісусе,
25 Якога Бог пастанавіў [быць] ахвярай перамольнай у крыві Ягонай праз веру, дзеля выяўленьня праведнасьці Сваёй праз дараваньне грахоў, учыненых раней, у [час] цярплівасьці Божае,
26 дзеля выяўленьня праведнасьці Сваёй у цяперашні час, каб быў Ён праведны і апраўдваў таго, хто верыць у Ісуса.
27 Дык дзе тое, чым хваліцца? Выключана. Якім законам? [Законам] учынкаў? Не, але законам веры.
28 Дык мы лічым, што чалавек апраўдваецца вераю, незалежна ад учынкаў Закону.
29 Няўжо Бог толькі Юдэяў, а не паганаў таксама? Так, і паганаў,
30 бо адзін Бог, Які апраўдае абразаньне з веры і неабразаньне праз веру.
31 Дык мы зьнішчаем Закон праз веру? Няхай ня станецца! Але ўсталёўваем Закон.

Рым 4

1 Дык што, скажам, Абрагам, бацька наш, знайшоў паводле цела?
2 Бо калі Абрагам апраўданы ўчынкамі, ён мае пахвалу, але ня перад Богам.
3 Бо што кажа Пісаньне? «Паверыў Абрагам Богу, і залічана яму за праведнасьць».
4 Таму, хто робіць, нагарода ня з ласкі залічваецца, але з павіннасьці;
5 а таму, хто ня робіць, але верыць у Таго, Хто апраўдвае бязбожніка, вера ягоная залічваецца за праведнасьць.

6 Гэтак і Давід кажа, што шчасьце чалавеку, якому Бог залічвае праведнасьць незалежна ад
учынкаў:
7 «Шчасьлівыя тыя, якім адпушчаныя беззаконьні і якім грахі прыкрытыя;
8 шчасьлівы чалавек, якому Госпад не залічыць грэху».
9 Дык шчаснасьць гэтая для абрэзаных ці і для неабрэзаных? Бо мы кажам, што Абрагаму вера
залічана за праведнасьць.
10 Дык калі залічана? У абразаньні ці ў неабразаньні? Не ў абразаньні, але ў неабразаньні.
11 І знак абразаньня ён атрымаў, як пячатку праведнасьці веры, якую [ён меў] у неабразаньні,
каб быў ён бацькам усіх, хто верыць у неабразаньні, каб і ім залічана была праведнасьць,
12 і бацькам абразаньня, тых, якія ня толькі [маюць] абразаньне, але і ходзяць па сьлядах веры
ў неабразаньні бацькі нашага Абрагама.
13 Бо не праз Закон Абрагаму ці насеньню ягонаму [дадзена] абяцаньне быць спадкаемцам
сьвету, але праз праведнасьць веры.
14 Бо калі тыя, што праз Закон, — спадкаемцы, змарнее вера і зьнішчыцца абяцаньне;
15 бо Закон выклікае гнеў, бо дзе няма закону, няма парушэньня.
16 Дзеля гэтага праз веру, каб было паводле ласкі, каб абяцаньне было ўгрунтаваным для ўсяго
насеньня, ня толькі для таго, якое праз Закон, але і для таго, якое праз веру Абрагама, які ёсьць
бацька ўсіх нас,
17 як напісана: «Я паставіў цябе бацькам многіх народаў», перад Богам, Якому ён паверыў, Які
ажыўляе мёртвых і называе тое, што ня ёсьць, як тое, што ёсьць.
18 Ён, насуперак надзеі, паверыў з надзеяй, што станецца бацькам многіх народаў, паводле
сказанага: «Гэткае будзе насеньне тваё».
19 І, не зьнямогшыся ў веры, ён не глядзеў на цела сваё ўжо амярцьвелае, якое мела амаль сто
гадоў, і што ўлоньне Сары амярцьвела,
20 у абяцаньні Божым не сумняваўся недаверствам, але ўмацаваўся вераю, аддаўшы славу Богу
21 і маючы пэўнасьць, што Ён магутны зрабіць тое, што абяцаў.
22 Дзеля гэтага і залічана яму за праведнасьць.
23 А напісана [гэта] ня дзеля яго толькі, што залічана яму,
24 але і дзеля нас, што мае быць залічана нам, якія вераць у Таго, Хто ўваскрасіў з мёртвых
Ісуса, Госпада нашага,
25 Які быў выдадзены дзеля грахоў нашых і ўваскрос дзеля апраўданьня нашага.

Рым 5

1 Дык, апраўдаўшыся вераю, мы маем мір з Богам праз Госпада нашага Ісуса Хрыста,
2 праз Якога таксама маем вераю доступ да тае ласкі, у якой стаім і хвалімся надзеяй славы
Божай.
3 І ня толькі [гэтым], але хвалімся і ў прыгнётах, ведаючы, што прыгнёт робіць цярплівасьць,
4 а цярплівасьць — выпрабаванасьць, а выпрабаванасьць — надзею,
5 а надзея ня ганьбіць, бо любоў Божая вылілася ў сэрцы нашыя праз Духа Сьвятога, Які нам
дадзены.
6 Бо Хрыстос, калі мы былі яшчэ слабымі, у вызначаны час памёр за бязбожных.
7 Бо за праведнага наўрад ці хто памрэ; хіба за добрага можа хто і адважыцца памерці.
8 А Бог Сваю любоў да нас даводзіць тым, што Хрыстос памёр за нас, калі мы былі [яшчэ]
грэшнікамі.
9 Дык тым больш цяпер, калі мы апраўданы крывёю Ягонай, збаўленыя будзем праз Яго ад
гневу.
10 Бо калі, будучы ворагамі, мы пагадзіліся з Богам праз сьмерць Сына Яго, шмат больш,
пагадзіўшыся, будзем збаўленыя праз жыцьцё Ягонае.
11 І ня толькі [гэтае], але таксама хвалімся Богам праз Госпада нашага Ісуса Хрыста, праз Якога
мы атрымалі цяпер прымірэньне.
12 Дзеля гэтага, як праз аднаго чалавека грэх увайшоў у сьвет, і праз грэх — сьмерць, і гэтак
сьмерць перайшла на ўсіх людзей, бо ў ім усе зграшылі.

13 Бо да Закону грэх быў у сьвеце; але грэх ня лічыцца, калі няма закону.
14 Аднак сьмерць валадарыла ад Адама да Майсея і над тымі, якія не зграшылі на падабенства
праступку Адама, які ёсьць вобраз Таго, Які мае быць.
15 Але дар [ласкі] ня гэткі, як грэх. Бо калі праз грэх аднаго памерлі многія, шмат большая
ласка Божая, і дар ласкі праз аднаго Чалавека, Ісуса Хрыста, памножыцца для многіх.
16 І дар не такі, як тое, што праз аднаго, які зграшыў; бо суд праз таго аднаго — на асуджэньне,
а дар [ласкі] — на апраўданьне ад многіх грахоў.
17 Бо калі праз грэх аднаго сьмерць валадарыла праз аднаго, шмат больш тыя, якія атрымалі
багацьце ласкі і дар праведнасьці, будуць валадарыць у жыцьці праз аднаго Ісуса Хрыста.
18 Таму, як праз грэх аднаго ўсім людзям асуджэньне, гэтак праз праведнасьць аднаго ўсім
людзям апраўданьне на жыцьцё.
19 Бо як праз непаслухмянасьць аднаго чалавека многія зрабіліся грэшнымі, так і праз
паслухмянасьць аднаго многія зробяцца праведнымі.
20 А Закон прыйшоў пасьля, каб памножыць грэх. А калі памножыўся грэх, тым больш
удосталь ласкі,
21 каб, як грэх валадарыў у сьмерці, гэтак і ласка валадарыла праз праведнасьць на жыцьцё
вечнае праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага.

Рым 6

1 Дык што скажам? Ці будзем заставацца ў граху, каб памножылася ласка? Няхай ня станецца!
2 Мы, якія памерлі для грэху, як яшчэ будзем жыць у ім?
3 Ці вы ня ведаеце, што ўсе мы, якія ахрысьціліся ў Хрыста Ісуса, у сьмерць Ягоную
ахрысьціліся?
4 Дык мы пахаваныя з Ім хрышчэньнем у сьмерць, каб, як Хрыстос уваскрос з мёртвых праз
славу Айца, так і мы хадзілі ў абнаўленьні жыцьця.
5 Бо калі мы сталіся злучанымі з Ім падабенствам сьмерці Яго, дык будзем [злучаны] і
[падабенствам] уваскрасеньня,
6 ведаючы тое, што стары наш чалавек укрыжаваны, каб зьнішчана было цела грэху, каб нам
не служыць ужо грэху;
7 бо хто памёр, той апраўданы ад грэху.
8 А калі мы памерлі з Хрыстом, дык верым, што і жыць будзем з Ім,
9 ведаючы, што Хрыстос, уваскросшы з мёртвых, больш не памірае, сьмерць больш над Ім не
пануе.
10 Бо, што Ён памёр, памёр раз дзеля грэху, а што жыве, жыве дзеля Бога.
11 Гэтак і вы лічыце сябе памёршымі дзеля грэху, а жывымі дзеля Бога ў Хрысьце Ісусе,
Госпадзе нашым.
12 Дык няхай не валадарыць грэх у сьмяротным целе вашым, каб вам слухацца яго ў
пажаданьнях ягоных.
13 І не аддавайце грэху члены вашыя як зброю няправеднасьці, але аддайце сябе Богу як
ажыўшых з мёртвых, і члены вашыя [аддайце] Богу як зброю праведнасьці.
14 Бо грэх ня будзе панаваць над вамі, бо вы не пад законам, але пад ласкаю.
15 Дык што? Ці будзем грашыць, бо мы не пад законам, але пад ласкаю? Няхай ня станецца!
16 Ці вы ня ведаеце, што, каму вы аддаяцё сябе на службу, каб [быць яму] паслухмянымі, таго
вы і слугі, каго слухаецеся: ці грэху — на сьмерць, ці паслухмянасьці — на праведнасьць.
17 Ласка Божая, што вы [раней] былі слугамі грэху, але сэрцам сталі паслухмянымі [гэтаму]
кшталту вучэньня, якое дадзена вам.
18 Вызваліўшыся ж ад грэху, вы сталіся слугамі праведнасьці.
19 Па-чалавечаму гавару дзеля нядужасьці цела вашага. Бо, як аддавалі вы члены вашыя
на службу нячыстасьці і беззаконьню на беззаконьне, гэтак цяпер аддайце члены вашыя на
службу праведнасьці на сьвятасьць.
20 Бо калі вы былі слугамі грэху, былі вы вольнымі ад праведнасьці.
21 Дык які плод вы мелі тады, што цяпер гэтага саромеецеся? Бо канец гэтакіх — сьмерць.

22 А цяпер, вызваліўшыся ад грэху і стаўшыся слугамі Бога, вы маеце плод свой на сьвятасьць,
а канец — жыцьцё вечнае.
23 Бо плата за грэх — сьмерць, а дар [ласкі] Божай — жыцьцё вечнае ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе
нашым.

Рым 7

1 Ці ж вы ня ведаеце, браты, бо кажу да тых, якія ведаюць Закон, што закон валадарыць над
чалавекам увесь час, пакуль той жывы?
2 Бо замужняя жанчына прывязана законам да жывога мужа; а калі муж памрэ, зьнішчаецца
закон мужа.
3 Таму, калі пры жывым мужы выйдзе за другога мужа, будзе названая чужаложніцай; а калі
памрэ муж, яна вольная ад закону і ня будзе чужаложніцай, выйшаўшы за другога мужа.
4 Гэтак і вы, браты мае, памерлі для Закону праз цела Хрыстовае, каб належаць вам другому,
Які ўваскрошаны з мёртвых, каб даваць плод Богу.
5 Бо калі мы былі ў целе, пакуты грахоў, якія [паўставалі] праз Закон, дзеялі ў членах вашых,
каб даваць плод сьмерці.
6 А цяпер мы вызваліліся ад Закону, якім былі зьвязаныя, памершы для яго, каб нам служыць
у абнаўленьні духа, а ня ў старасьці літары.
7 Дык што скажам? Ці Закон — грэх? Няхай ня станецца! Але я не зразумеў бы грэх, як толькі
праз Закон, бо я ня ведаў бы пажаданьня, каб Закон не сказаў: «Не жадай».
8 Але грэх, атрымаўшы нагоду праз прыказаньне, выклікаў у-ва мне ўсякае пажаданьне, бо без
закону грэх мёртвы.
9 Я жыў некалі без Закону, а калі прыйшло прыказаньне, грэх ажыў, а я памёр.
10 І было знойдзена мною, што прыказаньне, якое на жыцьцё, яно на сьмерць,
11 бо грэх, атрымаўшы нагоду праз прыказаньне, зьвёў мяне і забіў праз яго.
12 Так што Закон сьвяты, і прыказаньне сьвятое, і праведнае, і добрае.
13 Дык няўжо добрае сталася мне сьмерцю? Няхай ня станецца! Але грэх, каб быў выяўлены як
грэх, праз добрае робіць мне сьмерць, каб грэх стаўся праз меру грэшным праз прыказаньне.
14 Бо мы ведаем, што Закон духоўны, а я — цялесны, прададзены пад [уладу] грэху.
15 Бо я не разумею, што раблю, бо не раблю тое, што хачу, але, што ненавіджу, тое раблю.
16 А калі я раблю тое, што не хачу, згаджаюся з Законам, што ён — добры,
17 і цяпер ужо ня я раблю гэта, але грэх, які жыве ў-ва мне.
18 Бо ведаю, што не жыве ў-ва мне, гэта значыцца, у целе маім, добрае; бо жаданьне [добрага]
ёсьць у-ва мне, але каб зрабіць добрае, таго не знаходжу.
19 Бо добрае, якое хачу, не раблю, а благое, якога не хачу, раблю.
20 А калі я раблю тое, што не хачу, ужо ня я раблю гэта, але грэх, які жыве ў-ва мне.
21 Таму я знаходжу закон, што, калі хачу рабіць добрае, ёсьць у-ва мне благое.
22 Бо паводле ўнутранага чалавека я захапляюся Законам Божым,
23 а ў членах маіх бачу другі закон, які супрацівіцца закону розуму майго і бярэ мяне ў палон
закону грэху, які ёсьць у членах маіх.
24 Гаротны я чалавек! Хто выбавіць мяне ад гэтага цела сьмерці?
25 Дзякую Богу праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага. Дык таму я сам розумам служу Закону
Божаму, а целам — закону грэху.

Рым 8

1 Таму цяпер няма ніякага асуджэньня тым, што ў Хрысьце Ісусе не паводле цела, але паводле
духа ходзяць.
2 Бо закон Духа жыцьця ў Хрысьце Ісусе вызваліў мяне ад закону грэху і сьмерці.
3 Бо як Закон быў бяссільны, таму што быў нядужы праз цела, Бог, паслаўшы Сына Свайго ў
падабенстве цела грахоўнага і дзеля грэху, асудзіў грэх у целе,
4 каб праведнасьць Закону споўнілася ў нас, якія не паводле цела, але паводле духа ходзяць.
5 Бо тыя, што паводле цела, — пра цялеснае думаюць; а тыя, што паводле духа, — пра духоўнае.

6 Бо думкі цялесныя — сьмерць, а думкі духоўныя — жыцьцё і супакой.
7 Бо думкі цялесныя — варожасьць да Бога, бо яны не падпарадкоўваюцца закону Божаму, дый
ня могуць.
8 Дык тыя, якія ў целе, Богу дагадзіць ня могуць.
9 Вы ж ня ў целе, але ў духу, калі толькі Дух Божы жыве ў вас. А калі хто Духа Хрыстовага ня
мае, той не Ягоны.
10 Калі ж Хрыстос у вас, дык цела мёртвае праз грэх, а дух жывы праз праведнасьць.
11 А калі Дух Таго, Які ўваскрасіў Ісуса з мёртвых, жыве ў вас, Той, Які ўваскрасіў Хрыста з
мёртвых, ажывіць і вашыя сьмяротныя целы Духам Сваім, Які жыве ў вас.
12 Дык таму, браты, мы не вінаватыя цела, каб жыць паводле цела;
13 бо калі вы жывяцё паводле цела, памрацё, а калі духам цялесныя ўчынкі забіваеце, жыць
будзеце.
14 Бо ўсе, якія Духам Божым ведзеныя, ёсьць сыны Божыя.
15 Бо вы не атрымалі духа няволі ізноў на страх, але атрымалі Духа ўсынаўленьня, у Якім
крычым: «Абба, Ойча!»
16 Гэты Дух сьведчыць духу нашаму, што мы — дзеці Божыя.
17 А калі дзеці, дык і спадкаемцы, спадкаемцы Божыя, суспадчыньнікі Хрыста, калі толькі
церпім з Ім, каб з Ім і ўславіцца.
18 Бо я лічу, што пакуты цяперашняга часу [нічога] ня вартыя [ў параўнаньні] з той славаю,
што мае адкрыцца ў нас.
19 Бо стварэньне са спадзяваньнем чакае адкрыцьця сыноў Божых,
20 бо стварэньне падпарадкаванае марнасьці не сваёй ахвотай, але праз Таго, Які
падпарадкаваў, у надзеі,
21 што і само стварэньне будзе вызвалена з няволі сапсутасьці на свабоду славы дзяцей Божых.
22 Бо ведаем, што ўсё стварэньне супольна ўздыхае і мучыцца, родзячы, аж да цяпер.
23 І ня толькі яно, але і мы самі, маючы пачатак Духа, і мы самі ў сабе ўздыхаем, чакаючы
ўсынаўленьня, адкупленьня цела нашага.
24 Бо мы збаўленыя надзеяй. А надзея ўбачаная ня ёсьць надзея, бо калі хто бачыць, чаго яму
спадзявацца?
25 А калі спадзяемся на тое, чаго ня бачым, чакаем з цярплівасьцю.
26 Гэтаксама і Дух дапамагае ў слабасьцях нашых, бо мы ня ведаем, пра што маліцца, як трэба,
але Сам Дух заступаецца за нас стагнаньнямі невымоўнымі.
27 А Той, Які дасьледуе сэрцы, ведае, што за думка ў Духа, Які паводле [волі] Бога заступаецца
за сьвятых.
28 А мы ведаем, што тым, якія любяць Бога, пакліканым паводле [Яго] вызначэньня, усё
дапамагае на дабро.
29 Бо тым, каго наперад ведаў, Ён і прадвызначыў быць падобнымі да вобразу Сына Ягонага,
каб Ён быў Першародны між многімі братамі.
30 А каго прадвызначыў, тых і паклікаў; а каго паклікаў, тых і апраўдаў; а каго апраўдаў, тых і
ўславіў.
31 Дык што скажам на гэта? Калі Бог за нас, хто супраць нас?
32 Той, Які Сына Свайго не пашкадаваў, але аддаў Яго за ўсіх нас, як не даруе і нам з Ім усяго?
33 Хто стане супраць выбраных Божых? Бог, Які апраўдвае!
34 Хто той, хто асуджае? Хрыстос, Які памёр, але і ўваскрос! Ён і праваруч Бога, Ён і
заступаецца за нас.
35 Хто адлучыць нас ад любові Хрыстовае? Прыгнёт, ці ўціск, ці перасьледваньне, ці голад, ці
галізна, ці небясьпека, ці меч?
36 Як напісана: «За Цябе забіваюць нас цэлы дзень; лічаць нас за авечак на зарэз».
37 Але ў-ва ўсім гэтым мы перамагаем праз Таго, Які палюбіў нас.
38 Бо я ўпэўнены, што ані сьмерць, ані жыцьцё, ані анёлы, ані начальствы, ані сілы, ані
цяперашняе, ані будучае,

39 ані вышыня, ані глыбіня, ані другое якое стварэньне ня зможа адлучыць нас ад любові
Божае, што ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым.

Рым 9

1 Праўду кажу ў Хрысьце, не хлушу, сьведчыць мне сумленьне маё ў Духу Сьвятым,
2 што вялікі смутак мой і няспынны боль у сэрцы маім,
3 бо я хацеў бы сам быць адлучаным ад Хрыста за братоў маіх, родных мне паводле цела,
4 якія ёсьць Ізраільцяне, якіх ёсьць усынаўленьне, і слава, і запаветы, і даньне законаў, і
служэньне, і абяцаньні,
5 якіх і бацькі, і з якіх Хрыстос паводле цела, Які ёсьць над усімі Бог, Які дабраслаўлёны на вякі.
Амэн.
6 Але ня так, што слова Божае ня споўнілася. Бо ня ўсе тыя, што з Ізраіля, Ізраіль,
7 і ня ўсе тыя, якія насеньне Абрагама, дзеці [ягоныя], але: «У Ісааку будзе названае насеньне
табе».
8 Гэта значыць, ня дзеці цела ёсьць дзеці Божыя, але дзеці абяцаньня лічацца за насеньне.
9 Бо слова абяцаньня гэткае: «У гэту пару прыйду, і ў Сары будзе сын».
10 І ня толькі, але і Рэбэка зачала за адзін раз ад Ісаака, бацькі нашага.
11 Бо калі яны яшчэ не былі нарадзіўшыся і не зрабілі нічога добрага ці ліхога, каб вызначэньне
Божае заставалася паводле выбраньня, не праз учынкі, але праз Таго, Хто кліча,
12 сказана было ёй: «Большы будзе служыць меншаму»,
13 як напісана: «Якуба Я палюбіў, а Эзава зьненавідзеў».
14 Дык што скажам? Няўжо няправеднасьць у Бога? Няхай ня станецца!
15 Бо Ён кажа Майсею: «Зьлітуюся над тым, над кім зьлітуюся, і зьяўлю міласэрнасьць таму,
каму зьяўлю міласэрнасьць».
16 Таму [выбраньне залежыць] не ад таго, хто хоча, і не ад таго, хто бяжыць, але ад Бога, Які
літуецца.
17 Бо Пісаньне кажа фараону: «Дзеля таго Я падняў цябе, каб зьявіць на табе сілу Маю і каб імя
Маё было абвешчана на ўсёй зямлі».
18 Дзеля гэтага над кім хоча, літуецца, а каго хоча, закамяняе.
19 Дык ты скажаш мне: «Што Ён яшчэ вінаваціць? Бо хто супрацьстане пастанове Яго?»
20 Наадварот, чалавеча! Хто ты такі, што спрачаешся з Богам? Ці скажа зьлепленае таму, хто
зьляпіў: «Навошта ты мяне гэтак зрабіў?»
21 Ці ня мае ўлады ганчар над глінаю, каб з таго самага месіва зрабіць адно начыньне на
пашану, а другое — на ганьбу?
22 Што, калі Бог, хочучы зьявіць гнеў і зрабіць вядомай магутнасьць Сваю, з вялікай
доўгацярплівасьцю ашчаджаў начыньні гневу, прыгатаваныя на загубу,
23 каб таксама зрабіць вядомым багацьце славы Сваёй над начыньнямі міласэрнасьці, якія Ён
загадзя прыгатаваў на славу,
24 і над намі, якіх паклікаў ня толькі з Юдэяў, але і з паганаў?
25 Як і ў Осіі Ён кажа: «"Ня Мой народ" назаву Маім народам, і "Нялюбую" — улюбёнай.
26 І будзе, што на месцы, дзе сказана было ім: “Вы — ня Мой народ”, — там будуць названыя
сынамі Бога Жывога».
27 А Ісая крычыць пра Ізраіль: «Хаця б лічба сыноў Ізраіля была, як пясок марскі, рэштка будзе
збаўлена;
28 бо, сканчваючы слова і прысьпешваючы ў праведнасьці, хутка зьдзейсьніць Госпад слова на
зямлі».
29 І як раней сказаў Ісая: «Калі б Госпад Магуцьцяў не пакінуў нам насеньня, мы сталіся б, як
Садом, і былі б падобнымі да Гаморы».
30 Дык што скажам? Пагане, якія не імкнуліся да праведнасьці, атрымалі праведнасьць,
праведнасьць праз веру.
31 А Ізраіль, які імкнуўся да закону праведнасьці, не дасягнуў закону праведнасьці.

32 Чаму? Бо не праз веру, але праз учынкі закону. Бо яны спатыкнуліся аб камень спатыкненьня,
33 як напісана: «Вось, Я кладу на Сыёне камень спатыкненьня і скалу згаршэньня; і кожны, хто верыць у Яго, ня будзе асаромлены».

Рым 10

1 Браты! Упадабаньне сэрца майго і просьба да Бога пра Ізраіль на збаўленьне.
2 Бо сьведчу ім, што маюць руплівасьць Божую, але не паводле пазнаньня.
3 Бо, не разумеючы праведнасьці Божае і шукаючы паставіць сваю праведнасьць, яны не падпарадкаваліся праведнасьці Божай.
4 Бо канец Закону — Хрыстос, дзеля праведнасьці кожнаму, хто верыць.
5 Бо Майсей піша пра праведнасьць паводле Закону, што чалавек, які выканае яго, жыць будзе ім.
6 А праведнасьць праз веру гэтак кажа: «Не кажы ў сэрцы тваім: “Хто ўзыйдзе ў неба?”» — гэта ёсьць Хрыста зьвесьці [на зямлю];
7 або: «“Хто зыйдзе ў бездань?”» — гэта ёсьць Хрыста з мёртвых вывесьці.
8 Але што кажа? «Блізка да цябе слова, у вуснах тваіх і ў сэрцы тваім», — гэта ёсьць слова веры, якое мы абвяшчаем.
9 Бо калі ты вуснамі тваімі вызнаеш Ісуса Госпадам і ў сэрцы тваім будзеш верыць, што Бог уваскрасіў Яго з мёртвых, будзеш збаўлены,
10 бо сэрца верыць дзеля праведнасьці, а вусны вызнаюць дзеля збаўленьня.
11 Бо Пісаньне кажа: «Кожны, хто верыць у Яго, ня будзе асаромлены».
12 Бо няма розьніцы між Юдэем і Грэкам, бо Ён — Госпад усіх, багаты для ўсіх, што прызываюць Яго.
13 Бо кожны, хто прызаве імя Госпада, будзе збаўлены.
14 Але як прызываць Таго, у Каго ня вераць? А як верыць у Таго, пра Каго ня чулі? Як чуць без таго, хто абвяшчае?
15 А як абвяшчаць, калі не былі пасланыя? Як напісана: «Якія прыгожыя ногі таго, хто дабравесьціць супакой, дабравесьціць добрае!»
16 Але ня ўсе паслухаліся Эвангельля, бо Ісая кажа: «Госпадзе! Хто паверыў пачутаму ад нас?»
17 Таму вера — ад слуханьня, а слуханьне — праз слова Божае.
18 Але кажу: Ці ж яны ня чулі? Наадварот, «на ўсю зямлю пайшоў голас іхні, і да межаў сусьвету — словы іхнія».
19 Але кажу: Ці ж Ізраіль ня ведаў? Першы Майсей кажа: «Я збуджу ў вас рупнасьць праз [тых, хто] не народ, праз народ, які ня цяміць, раздражню вас».
20 А Ісая адважваецца і кажа: «Мяне знайшлі тыя, якія не шукалі Мяне, Я аб’явіўся тым, якія не пыталіся Мяне».
21 А наконт Ізраіля кажа: «Увесь дзень выцягваў Я рукі Мае да народу, які не скараецца і працівіцца».

Рым 11

1 Дык кажу: няўжо Бог адапхнуў народ Свой? Няхай ня станецца! Бо і я — Ізраільцянін, з насеньня Абрагама, з калена Бэн’яміна.
2 Не адапхнуў Бог народу Свайго, які Ён наперад ведаў. Ці ня ведаеце, што кажа Пісаньне пра Ільлю, як той скардзіцца Богу на Ізраіля, кажучы:
3 «Госпадзе! Прарокаў Тваіх пазабівалі і ахвярнікі Твае зруйнавалі; застаўся я адзін, і душу маю шукаюць».
4 Але што кажа яму адказ Божы? «Я пакінуў Сабе сем тысячаў мужоў, якія не схілілі калені перад Баалам».
5 Дык гэтак і ў цяперашні час рэшта паводле выбраньня ласкі захавалася.
6 А калі праз ласку, дык не праз учынкі, інакш ласка ўжо ня ёсьць ласка. А калі праз учынкі, дык гэта ня ласка, інакш учынак ужо ня ёсьць учынак.

7 Дык што? Што шукае Ізраіль, таго не атрымаў; выбраныя атрымалі, а іншыя былі
закамянелыя [сэрцам],
8 як напісана: «Даў ім Бог духа дрымоты, вочы, якімі ня бачаць, і вушы, якімі ня чуюць, аж да
сёньняшняга дня».
9 І Давід кажа: «Няхай станецца стол іхні пасткаю, і цянётамі, і згаршэньнем, і аднагародаю.
10 Няхай зацемняцца вочы іхнія, якімі ня бачаць, і хрыбет іхні няхай будзе сагнуты
назаўсёды».
11 Дык кажу: Няўжо яны спатыкнуліся, каб упасьці? Няхай ня станецца. Але праступак іхні —
збаўленьне паганам, каб збудзіць у іх рупнасьць.
12 Калі ж праступак іхні — багацьце сьвету, і ўпадак іхні — багацьце паганаў, дык наколькі
больш поўнасьць іхняя?
13 Бо кажу вам, паганам: Як апостал паганаў, я ўслаўляю служэньне маё,
14 бо, можа, збуджу руплівасьць у маіх паводле цела і ці ня збаўлю некаторых з іх.
15 Бо калі згуба іхняя — прымірэньне сьвету, дык што прыняцьцё, як не жыцьцё з мёртвых?
16 Калі зачатак сьвяты, дык і месіва; і калі корань сьвяты, дык і галіны.
17 Калі ж некаторыя з галінаў былі адламаныя, а ты, дзікая аліўка, быў прышчэплены замест
іх і стаўся ўдзельнікам кораня і тлустасьці аліўкі,
18 не вывышайся перад галінамі; а калі вывышаешся, дык [ведай, што] ня ты трымаеш корань,
але корань — цябе.
19 Дык скажаш: «Галіны былі адламаныя, каб я быў прышчэплены».
20 Добра. Яны адламаныя праз недаверства, а ты трымаешся праз веру; дык не ўзьвялічвайся,
але бойся.
21 Бо калі Бог прыродных галінаў не пашкадаваў, дык ці цябе пашкадуе.
22 Дык глядзі на ласкавасьць і срогасьць Божую, срогасьць да тых, якія ўпалі, а ласкавасьць да
цябе, калі застанешся ў ласкавасьці [Божай], іначай і ты будзеш сьсечаны.
23 І тыя, калі не застануцца ў недаверстве, будуць прышчэпленыя, бо Бог магутны ізноў
прышчапіць іх.
24 Бо калі ты адсечаны ад дзікае паводле прыроды аліўкі і, насуперак прыродзе, прывіты
да добрае аліўкі, наколькі больш тыя, якія паводле прыроды [ад добрае аліўкі], будуць
прышчэпленыя да сваёй аліўкі?
25 Бо не хачу, браты, каб вы ня ведалі гэтае тайны, каб вы не былі мудрымі праз сябе, што
скамяненьне сталася ў Ізраілі часткова, аж пакуль ня ўвойдзе поўнасьць паганаў,
26 і гэтак увесь Ізраіль збаўлены будзе, як напісана: «Прыйдзе з Сыёну Выбавіцель і адверне
бязбожнасьць ад Якуба.
27 І гэта Мой запавет з імі, калі забяру грахі іхнія».
28 Дык паводле Эвангельля яны — ворагі для вас, а паводле выбраньня — улюбёныя дзеля
бацькоў.
29 Бо нязьменныя дары і пакліканьне Божае.
30 Бо як і вы некалі не скараліся Богу, а цяпер памілаваныя праз няскоранасьць іхнюю,
31 гэтак і яны цяпер не скараюцца дзеля вашага памілаваньня, каб і яны былі памілаваныя.
32 Бо ўсіх Бог замкнуў у няскоранасьць, каб усіх памілаваць.
33 О, глыбіня багацьця, і мудрасьці, і веданьня Божага! Як неспасьцігальныя прысуды Ягоныя
і недасьледныя шляхі Ягоныя!
34 Бо хто пазнаў розум Госпада? Ці хто стаўся дарадцам Яму?
35 Ці хто даў Яму наперад, каб Ён аддаў яму?
36 Бо ўсё з Яго, і праз Яго, і для Яго. Яму слава на вякі. Амэн.

Рым 12

1 Дык прашу вас, браты, праз міласэрнасьць Божую, аддайце целы вашыя на ахвяру жывую,
сьвятую, прыемную Богу, на разумнае служэньне вашае,

2 і не прыпадабняйцеся веку гэтаму, але перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага, каб
вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае [Богу], і дасканалае.
3 Бо праз ласку, дадзеную мне, кажу кожнаму з вас: ня думайце [пра сябе] больш, чым трэба
думаць, але думайце цьвяроза, як Бог кожнага надзяліў мерай веры.
4 Бо як у адным целе маем шмат членаў, але ня ўсе члены маюць тую самую работу,
5 гэтак мы, многія, зьяўляемся адным целам у Хрысьце, а паасобку адзін для аднаго — члены.
6 Калі ж, паводле дадзенай нам ласкі, маем розныя дары, калі прароцтва, [няхай будзе] згодна
з верай;
7 калі служэньне — у служэньні; калі хто вучыць — у навучаньні;
8 калі хто суцяшае — у суцяшэньні; калі хто раздае — у шчырасьці; калі хто кіруе — з
дбайнасьцю; калі хто чыніць міласэрнасьць — з ахвотаю.
9 Любоў [няхай будзе] некрывадушная; брыдзьцеся зла, прыляпляйцеся да дабра.
10 Братняя любоў адзін да аднаго [няхай будзе] ад усяго сэрца, у пашане адзін аднаго
выпярэджвайце;
11 у дбайнасьці не лянуйцеся; духам палайце; Госпаду служыце;
12 [маючы] надзею, радуйцеся; у прыгнёце будзьце вытрывалымі; у малітве — няспыннымі;
13 у патрэбах сьвятых бярыце ўдзел; імкніцеся да гасьціннасьці.
14 Дабраслаўляйце тых, якія вас перасьледуюць, дабраслаўляйце, а не кляніце.
15 Радуйцеся з тымі, хто радуецца, і плачце з тымі, хто плача.
16 Думайце адзін пра аднаго аднолькава; не ўзьвялічвайце саміх сябе, але пакорнымі
захапляйцеся; ня будзьце мудрымі самі праз сябе.
17 Нікому не аддаючы ліхотай за ліхоту, дбайце пра добрае перад усімі людзьмі.
18 Калі магчыма для вас, мейце супакой з усімі людзьмі.
19 Ня помсьціце за сябе, улюбёныя, але дайце месца гневу [Божаму], бо напісана: «“Мне
[належыць] помста, Я аддам”, — кажа Госпад».
20 Дык, калі вораг твой галодны, накармі яго; калі смагне, напаі яго; бо, робячы гэтае, зьбярэш
яму на галаву вугольлі распаленыя.
21 Ня будзь пераможаны злом, але перамагай зло дабром.

Рым 13

1 Усякая душа няхай падпарадкоўваецца вышэйшым уладам, бо няма ўлады, каб не ад Бога; а
ўлады, якія ёсьць, ад Бога пастаўлены.
2 Так што, хто працівіцца ўладзе, супрацьстаіць Божай пастанове. А тыя, якія супрацьстаяць,
самі на сябе прысуд атрымаюць.
3 Бо начальнікі страшныя не для тых, якія робяць добрае, але [для тых, якія робяць] кепскае.
А хочаш не баяцца ўлады, рабі добрае, і будзеш мець пахвалу ад яе.
4 Бо [начальнік — гэта] Божы служыцель табе на дабро. А калі робіш злое, бойся, бо ён не
дарэмна носіць меч, бо ён — Божы служыцель, мсьціўца на гнеў таму, хто робіць злое.
5 Дзеля гэтага трэба падпарадкоўвацца ня толькі з увагі на гнеў, але і на сумленьне.
6 Бо дзеля гэтага вы і падаткі плаціце, бо яны — Божыя служыцелі, гэтым самым заўсёды
занятыя.
7 Дык аддавайце кожнаму належнае: каму падатак — падатак, каму мыта — мыта, каму страх
— страх; каму пашану — пашану.
8 Ня будзьце вінныя нікому нічога, апрача ўзаемнай любові, бо хто любіць іншага, той споўніў
Закон.
9 Бо прыказаньні «Не чужалож», «Не забівай», «Не крадзі», «Ня сьведчы фальшыва», «Не
пажадай» і кожнае іншае зьмяшчаюцца ў гэтым слове: «Любі бліжняга твайго як самога сябе».
10 Любоў ня робіць благога бліжняму; дык любоў — гэта спаўненьне Закону.
11 І гэтак [рабіце], ведаючы час, што ўжо гадзіна абудзіцца нам зо-сну, бо цяпер бліжэй да нас
збаўленьне, чым калі мы паверылі.
12 Ноч зыходзіць, а дзень наблізіўся, дык адкінем справы цемры і апранемся ў зброю сьвятла.

13 Як удзень, будзем хадзіць прыстойна, не ў гулянках і п’янстве, не ў юрлівасьці і
бессаромнасьці, ня ў сварцы і зайздрасьці,
14 але апраніцеся ў Госпада Ісуса Хрыста і не дагаджайце целу ў пажаданьнях.

Рым 14

1 А таго, хто слабы ў веры, прыймайце не на [тое, каб] спрачацца пра погляды.
2 Бо нехта верыць, што [можна] есьці ўсё, а слабы есьць гародніну.
3 Хто есьць, не пагарджай тым, хто ня есьць; і хто ня есьць, не судзі таго, хто есьць, бо Бог
прыняў яго.
4 Хто ты такі, які судзіш чужога слугу? Перад сваім гаспадаром ён стаіць або падае, а будзе
стаяць, бо Бог магутны паставіць яго.
5 Нехта судзіць [па-рознаму] дзень супраць дня, а нехта судзіць усякі дзень [аднолькава].
Кожны будзь пэўны ў сваім розуме.
6 Хто адрозьнівае дні, дзеля Госпада адрозьнівае; і хто не адрозьнівае дзён, дзеля Госпада не
адрозьнівае. Хто есьць, дзеля Госпада есьць, бо дзякуе Богу. І хто ня есьць, дзеля Госпада ня
есьць, і дзякуе Богу.
7 Бо ніхто з нас не жыве дзеля сябе, і ніхто не памірае дзеля сябе;
8 бо як, калі жывем, дзеля Госпада жывем, так і, калі паміраем, дзеля Госпада паміраем. Таму
і калі жывем, і калі паміраем, мы — Госпадавы.
9 Бо Хрыстос дзеля таго і памёр, і ўваскрос, і жыве, каб валадарыць і над мёртвымі, і над
жывымі.
10 А ты навошта судзіш брата твайго? Або навошта ты пагарджаеш братам тваім? Бо ўсе мы
станем перад пасадам судовым Хрыста.
11 Бо напісана: «Жыву Я, — кажа Госпад, — перада Мною схіліцца ўсякае калена, і ўсякі язык
будзе вызнаваць Бога».
12 Дык таму кожны з нас за сябе дасьць справаздачу Богу.
13 Дык ня будзем больш судзіць адзін аднаго, але судзіце лепш пра тое, каб як не пакласьці
перад братам спатыкненьня ці згаршэньня.
14 Я ведаю і перакананы ў Госпадзе Ісусе, што няма нічога нячыстага праз сябе; толькі таму,
хто лічыць нешта нячыстым, гэта нячыстае.
15 А калі дзеля ежы засмучаецца брат твой, ты ўжо не паводле любові ходзіш. Не губі тваёю
ежаю таго, за каго памёр Хрыстос.
16 Дык няхай ня блюзьняць на вашае добрае.
17 Бо Валадарства Божае — гэта ня ежа і піво, але праведнасьць, і супакой, і радасьць у Духу
Сьвятым.
18 Бо хто ў гэтым служыць Хрысту, той даспадобы Богу і варты між людзьмі.
19 Дык таму будзем імкнуцца да таго, што [служыць] дзеля супакою і ўзаемнага збудаваньня.
20 Не руйнуй дзеля ежы справы Божай. Усё, па праўдзе, чыстае, але ліхое для чалавека, які
есьць праз спатыкненьне.
21 Добра ня есьці мяса, і ня піць віна, і [не рабіць] нічога, ад чаго брат твой спатыкаецца, ці
згаршаецца, ці слабее.
22 Ты маеш веру? Мей сам у сабе перад Богам. Шчасьлівы той, хто ня судзіць сябе ў тым, што
спрабуе.
23 А хто сумняецца, калі есьць, асуджаны, бо [робіць] не паводле веры; а ўсё, што не паводле
веры, — грэх.

Рым 15

1 Мы, моцныя, павінны насіць слабасьці нямоглых і не дагаджаць сабе.
2 Бо кожны з нас няхай дагаджае бліжняму на дабро, дзеля збудаваньня.
3 Бо і Хрыстос не Сабе дагаджаў, але, як напісана: «Зьнявагі тых, якія зьневажаюць Цябе, упалі
на Мяне».
4 Бо ўсё, што было напісана, было напісана дзеля нашага навучаньня, каб праз цярплівасьць і
суцяшэньне з Пісаньняў мы мелі надзею.

5 А Бог цярплівасьці і суцяшэньня няхай дасьць вам тое самае думаць між сабою паводле
[ўзору] Хрыста Ісуса,
6 каб вы аднадушна, аднымі вуснамі славілі Бога і Айца Госпада нашага Ісуса Хрыста.
7 Дзеля гэтага прыймайце адзін аднаго, як і Хрыстос прыняў нас у славу Божую.
8 Бо я кажу, што Ісус Хрыстос стаўся служыцелем абразаньня дзеля праўды Божай, каб
пацьвердзіць абяцаньні бацькам,
9 а [служыцелем] паганаў — дзеля літасьці, каб славілі Бога, як напісана: «Дзеля гэтага буду
вызнаваць Цябе між паганамі і сьпяваць пра імя Тваё».
10 І яшчэ кажа: «Узьвесяліцеся, пагане, з народам Яго!»
11 І яшчэ: «Хваліце Госпада, усе пагане, і ўсхваляйце Яго, усе народы!»
12 І яшчэ Ісая кажа: «Будзе корань Есэя, Той, Які паўстане, панаваць над народамі; на Яго
народы спадзявацца будуць».
13 А Бог надзеі няхай напоўніць вас усякай радасьцю і супакоем у веры, каб памножыць у вас
надзею моцаю Духа Сьвятога.
14 І я сам, браты мае, перакананы адносна вас, што і вы поўныя добрасьці, напоўненыя ўсякім
веданьнем і можаце настаўляць адзін аднаго.
15 А тым сьмялей пісаў я да вас, браты, часткова, каб нагадаць вам праз дадзеную мне ад Бога
ласку
16 быць мне служыцелем Ісуса Хрыста для паганаў, сьвятарна служачы Эвангельлю Божаму,
каб ахвяра паганаў, асьвячоная Духам Сьвятым, была адпаведнай.
17 Дык маю пахвалу ў Хрысьце Ісусе ў тым, што Божае,
18 бо не адважуся гаварыць нешта такое, чаго не зрабіў Хрыстос праз мяне дзеля
[прывядзеньня да] паслухмянасьці паганаў, словам і справаю,
19 у моцы знакаў і цудаў, у моцы Духа Божага, так што Эвангельле Хрыстовае пашырана мною
ад Ерусаліму і ваколіцы аж да Ілірыка.
20 А пры гэтым я намагаўся дабравесьціць ня там, дзе быў абвешчаны Хрыстос, каб не будаваць
на чужым падмурку,
21 але, як напісана: «Тыя, якім не было абвешчана пра Яго, убачаць, і тыя, якія ня чулі,
зразумеюць».
22 Дзеля гэтага я і меў шмат перашкодаў, каб прыйсьці да вас.
23 Цяпер жа, ня маючы больш месца ў гэтых краях і шмат год маючы жаданьне прыйсьці да
вас,
24 як толькі пайду ў Гішпанію, прыйду да вас, бо спадзяюся, праходзячы, пабачыцца з вамі, і
што вы правядзеце мяне туды, калі часткова насычуся [супольнасьцю] з вамі.
25 А цяпер я іду ў Ерусалім паслужыць сьвятым,
26 бо спадабалася Македоніі і Ахаі зрабіць нейкую падтрымку ўбогім сьвятым, якія ў
Ерусаліме.
27 Спадабалася, бо яны вінаватыя іхнія, бо калі пагане сталіся супольнікамі іхнімі ў духоўным,
дык павінны паслужыць ім у цялесным.
28 А зьдзейсьніўшы гэта і перадаўшы ім пад пячаткай плод гэты, адыйду праз вас у Гішпанію.
29 А ведаю, што, прыйшоўшы да вас, прыйду ў поўні дабраслаўленьня Эвангельля Хрыстовага.
30 Малю ж вас, браты, Госпадам нашым Ісусам Хрыстом і любоўю Духа, стаць разам са мною ў
малітвах за мяне да Бога,
31 каб быць мне выбаўленым ад тых, якія ня вераць, у Юдэі, і каб служэньне маё для Ерусаліму
было адпаведным для сьвятых,
32 каб я ў радасьці прыйшоў да вас паводле волі Бога і супачыў з вамі.
33 А Бог супакою [няхай будзе] з усімі вамі. Амэн.

Рым 16

1 Даручаю ж вам Фэбу, сястру нашую, якая ёсьць служыцелькай царквы ў Кенхрэях,
2 каб вы прынялі яе ў Госпадзе, як дастойна сьвятым, і дапамаглі ёй, у чым яна будзе мець у
вас патрэбу, бо і яна была падтрымкай для многіх і для мяне самога.

3 Прывітайце Прыскілу і Акілу, супрацоўнікаў маіх у Хрысьце Ісусе,
4 якія за душу маю падстаўлялі шыі свае, якім ня я адзін дзякую, але і ўсе цэрквы паганаў, і
царкву, якая ў іхнім доме.
5 Прывітайце Эпэнэта, улюбёнага майго, які ёсьць зачаткам Ахаі для Хрыста.
6 Прывітайце Марыю, якая шмат працавала дзеля нас.
7 Прывітайце Андроніка і Юнію, сваякоў маіх і вязьняў са мною, якія знакамітыя між апосталаў
і якія раней за мяне былі ў Хрысьце.
8 Прывітайце Амплія, улюбёнага майго ў Госпадзе.
9 Прывітайце Урбана, супрацоўніка нашага ў Хрысьце, і Стахія, улюбёнага майго.
10 Прывітайце Апэлеса, выпрабаванага ў Хрысьце. Прывітайце тых, якія Арыстабулавы.
11 Прывітайце Іradыёна, сваяка майго. Прывітайце з Наркісавых тых, якія ў Госпадзе.
12 Прывітайце Трыфэну і Трыфосу, якія працуюць у Госпадзе. Прывітайце любую Пэрсіду, якая
шмат працавала ў Госпадзе.
13 Прывітайце Руфа, выбранага ў Госпадзе, і маці ягоную і маю.
14 Прывітайце Асінкрыта, Флегонта, Германа, Патроба, Гермеса і братоў, якія з імі.
15 Прывітайце Філялёга і Юлію, Нэрэя і сястру ягоную, і Алімпана, і ўсіх сьвятых, якія з імі.
16 Прывітайце адзін аднаго ў сьвятым пацалунку. Вітаюць вас цэрквы Хрыстовыя.
17 Прашу вас, браты, зважайце на тых, якія робяць нязгоду і згаршэньні насуперак вучэньню,
якому вы навучыліся, і ўхіляйцеся ад іх.
18 Бо гэткія служаць ня Госпаду нашаму Ісусу Хрысту, але свайму жывату, і красамоўствам ды
ласкавасьцю зводзяць сэрцы нявінных.
19 Бо вашая паслухмянасьць вядомая ўсім, дык я радуюся дзеля вас, але хачу, каб вы былі
мудрыя на добрае і не зьмешаныя з ліхім.
20 А Бог супакою неўзабаве скрышыць шатана пад нагамі вашымі. Ласка Госпада нашага Ісуса
Хрыста з вамі. Амэн.
21 Вітаюць вас Цімафей, супрацоўнік мой, і Луцый, і Язон, і Сасіпатр, сваякі мае.
22 Вітаю вас у Госпадзе я, Тэрцый, які пісаў гэтае пасланьне.
23 Вітае вас Гай, гасьцінны для мяне і для ўсяе царквы. Вітае вас Эраст, скарбнік гораду, і брат
Кварт.
24 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. Амэн.
25 А Таму, Які можа ўмацаваць вас паводле Эвангельля майго і пропаведзі Ісуса Хрыста,
паводле адкрыцьця таямніцы, пра якую замоўчвалася ад часоў адвечных,
26 і якая цяпер яўлена праз прарочыя Пісаньні і, паводле загаду Адвечнага Бога, абвешчана
ўсім народам, [каб прыйшлі да] паслухмянасьці веры,
27 Адзінаму Мудраму Богу праз Ісуса Хрыста слава на вякі. Амэн.

ПЕРШАЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА КАРЫНЬЦЯНАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, з волі Божай пакліканы апостал Ісуса Хрыста, і Састэн, брат, —
2 царкве Божай, якая ў Карыньце, асьвячоным у Хрысьце Ісусе, пакліканым сьвятым з усімі,
якія прызываюць імя Госпада нашага Ісуса Хрыста ў-ва ўсякім месцы, у іх і ў нас:
3 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
4 Заўсёды дзякую Богу майму за вас з прычыны ласкі Божае, дадзенае вам у Хрысьце Ісусе,
5 бо ўсім вы ўзбагаціліся ў Ім, усякім словам і ўсякім веданьнем, —
6 бо сьведчаньне Хрыстовае сьцьверджана ў вас, —
7 так што вы ня маеце нястачы ані ў якім дары, чакаючы адкрыцьця Госпада нашага Ісуса
Хрыста,
8 Які і ўгрунтуе вас да канца быць бездакорнымі ў дзень Госпада нашага Ісуса Хрыста.
9 Верны Бог, праз Якога вы пакліканыя ў супольнасьць Сына Ягонага Ісуса Хрыста, Госпада
нашага.
10 Малю вас, браты, у імя Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб усе вы казалі тое самае, і не было
між вамі падзелаў, але каб вы былі злучаны ў тым самым розуме і ў той самай думцы.
11 Бо паведамлена мне ад Хлоіных пра вас, браты мае, што між вамі ёсьць сваркі.
12 А кажу пра тое, што кожны з вас кажа: «Я — Паўлавы», «А я — Апалёсавы», «А я — Кіфавы»,
«А я — Хрыстовы».
13 Ці разьдзяліўся Хрыстос? Ці Павал быў укрыжаваны за вас? Ці ў імя Паўла вы былі
ахрышчаныя?
14 Дзякую Богу, што я нікога з вас не ахрысьціў, акрамя Крыспа і Гая,
15 каб не сказаў хто, што я хрысьціў у маё імя.
16 Ахрысьціў я таксама дом Стэфана, а ці ахрысьціў яшчэ каго, ня ведаю.
17 Бо Хрыстос паслаў мяне не хрысьціць, але дабравесьціць, і ня ў мудрасьці слова, каб не
прынізіць крыжа Хрыстовага.
18 Бо слова пра крыж для тых, якія гінуць, ёсьць глупства, а для нас, якія ідуць на збаўленьне,
— сіла Божая.
19 Бо напісана: «Загублю мудрасьць мудрых і розум разумных адкіну».
20 Дзе мудры? Дзе кніжнік? Дзе дасьледчык гэтага веку? Ці не зрабіў Бог мудрасьць сьвету
гэтага глупствам?
21 Бо калі сьвет праз мудрасьць не пазнаў Бога ў мудрасьці Божай, спадабалася Богу праз
глупства пропаведзі збавіць тых, якія вераць.
22 Бо і Юдэі просяць знакаў, і Грэкі шукаюць мудрасьці;
23 а мы абвяшчаем Хрыста ўкрыжаванага, для Юдэяў — згаршэньне, а для Грэкаў — глупства,
24 а для тых, якія пакліканыя, і Юдэяў, і Грэкаў, — Хрыста, Божую сілу і Божую мудрасьць.
25 Бо тое, што дурное ў Бога, мудрэйшае за людзей, і тое, што слабое ў Бога, дужэйшае за
людзей.
26 Бо паглядзіце, браты, на пакліканьне вашае, што ня шмат [сярод вас] мудрых паводле цела,
ня шмат магутных, ня шмат высакародных,
27 але Бог выбраў дурноту сьвету, каб асароміць мудрых, і слабое сьвету выбраў Бог, каб
асароміць магутных,
28 і бязроднае сьвету, і пагарджанае, і тое, што ёсьць нічым, выбраў Бог, каб зьнішчыць тое,
што нечым ёсьць,
29 каб ніводнае цела не хвалілася перад Ім.
30 А вы — з Яго ў Хрысьце Ісусе, Які стаўся для нас мудрасьцю ад Бога, і праведнасьцю, і
асьвячэньнем, і адкупленьнем,
31 каб было, як напісана: «Хто хваліцца, няхай у Госпадзе хваліцца».

1 Кар 2

1 І я, прыйшоўшы да вас, браты, прыйшоў прапаведваць вам сьведчаньне Божае ня ўзвышаным
словам ці мудрасьцю,
2 бо я судзіў ня ведаць у вас нічога, акрамя Ісуса Хрыста, і Таго, Які ўкрыжаваны.
3 І быў я ў вас у немачы, і ў страху, і ў вялікім трымценьні.
4 І слова маё, і пропаведзь мая былі не ў пераканаўчых словах чалавечае мудрасьці, але ў
выяўленьні Духа і сілы,
5 каб вера ваша была ня ў мудрасьці чалавечай, але ў сіле Божай.
6 А мудрасьць мы гаворым сярод дасканалых, але мудрасьць ня гэтага веку і не князёў гэтага
веку, што зьнішчаюцца,
7 але гаворым мудрасьць Божую, якая ў тайне, схаваную, якую прадвызначыў Бог перад вякамі
на славу нашую,
8 якое ніхто з князёў веку гэтага не зразумеў, бо калі б зразумелі, дык не ўкрыжавалі б Госпада
славы.
9 Але як напісана: «Вока ня бачыла, і вуха ня чула, і не ўзыходзіла на сэрца чалавека тое, што
Бог прыгатаваў тым, якія любяць Яго».
10 А нам Бог адкрыў праз Духа Свайго, бо Дух усё дасьледуе, і глыбіні Божыя.
11 Бо хто з людзей ведае, што ў чалавеку, акрамя духа чалавечага, які ў ім? Гэтак і таго, што ў
Бога, ніхто ня ведае, акрамя Духа Божага.
12 А мы атрымалі ня духа сьвету, але Духа, Які ад Бога, каб ведаць, што падаравана нам ад Бога.
13 І гэта мы гаворым ня словамі, якім [нас] навучыла мудрасьць чалавечая, але [словамі], якім
навучыў Дух Сьвяты, параўноўваючы духоўнае з духоўным.
14 А душэўны чалавек ня прыймае таго, што ад Духа Божага, бо гэта глупства для яго, і ня можа
зразумець, бо пра гэта судзіцца духоўна.
15 А духоўны судзіць усё, сам жа ён нікім ня судзіцца.
16 Бо хто зразумеў розум Госпада, што будзе [нешта] даводзіць Яму? А мы маем розум
Хрыстовы.

1 Кар 3

1 І я ня мог гаварыць вам, браты, як духоўным, але як цялесным, як немаўлятам у Хрысьце.
2 Я паіў вас малаком, а не [карміў] ежай, бо вы былі яшчэ нямоглыя, дый цяпер яшчэ
нямоглыя.
3 Бо вы яшчэ цялесныя. Бо калі між вамі зайздрасьць, сваркі і нязгода, дык ці не цялесныя вы
і ці не па-чалавечаму ходзіце?
4 Бо калі адзін кажа: «Я — Паўлавы», а другі: «Я — Апалёсавы», ці не цялесныя вы?
5 Хто Павал? Хто Апалёс? Яны толькі служыцелі, праз якіх вы паверылі, і кожны такі, як даў
Госпад.
6 Я пасадзіў, Апалёс паліваў, але расьціў Бог.
7 Так што ані той, які садзіў, ані той, які паліваў, ня ёсьць некім, але Той, Які дае расьці, — Бог.
8 А хто садзіць і хто палівае, ёсьць адно, і кожны атрымае сваю нагароду паводле сваёй працы.
9 Бо мы — супрацоўнікі Божыя, а вы — Божая ніва, Божая пабудова.
10 Я, паводле дадзенай мне ласкі Божай, як мудры будаўнічы, заклаў падмурак, а другі будуе
[на ім]. Кожны няхай глядзіць, як будуе.
11 Бо ніхто ня можа закласьці іншага падмурку, апрача пастаўленага, які ёсьць Ісус Хрыстос.
12 А калі хто будуе на гэтым падмурку з золата, срэбра, каштоўных камянёў, дрэва, сена,
саломы, —
13 работа кожнага выявіцца; бо дзень пакажа, таму што ў агні адкрываецца, і агонь выспрабуе
работу кожнага, якая яна ёсьць.
14 Калі чыя работа, якую ён будаваў, застанецца, той атрымае нагароду.
15 Калі чыя работа згарыць, той згубіць яе, сам жа будзе збаўлены, але так, як праз агонь.
16 Ці вы ня ведаеце, што вы — бажніца Божая, і Дух Божы жыве ў вас?

17 Калі хто зьнішчыць бажніцу Божую, таго зьнішчыць Бог, бо бажніца Божая сьвятая, а гэтая
[бажніца] — вы.
18 Ніхто няхай ня зводзіць сам сябе. Калі хто з вас думае быць мудрым у гэтым веку, няхай
будзе дурным, каб быць мудрым.
19 Бо мудрасьць сьвету гэтага ёсьць глупства перад Богам, бо напісана: «Ён ловіць мудрых у
падступнасьці іхняй».
20 І зноў: «Госпад ведае думкі мудрых, што яны марныя».
21 Так што ніхто няхай ня хваліцца між людзей, бо ўсё вашае:
22 ці Павал, ці Апалёс, ці Кіфа, ці сьвет, ці жыцьцё, ці сьмерць, ці цяперашняе, ці будучае, — усё
вашае;
23 вы ж — Хрыстовыя, а Хрыстос — Божы.

1 Кар 4

1 Гэтак няхай лічаць нас людзі за паслугачоў Хрыстовых і за аканомаў тайнаў Божых.
2 Ад аканомаў жа, урэшце, вымагаецца, каб кожны быў знойдзены верным.
3 Для мяне малая [рэч], як судзіце пра мяне вы ці іншыя людзі; але я і сам не суджу сябе.
4 Бо хоць нічога ня ведаю за сабою, але ў гэтым я не апраўданы. Госпад — Той, Які судзіць мяне.
5 Так што не судзіце перад часам, пакуль ня прыйдзе Госпад, Які і асьветліць схаванае ў цемры,
і выявіць намеры сэрцаў; і тады кожнаму будзе пахвала ад Бога.
6 А гэтае, браты, аднёс я да сябе і Апалёса дзеля вас, каб вы ад нас навучыліся ня думаць больш
за тое, што напісана, каб не ганарыліся адзін перад адным.
7 Бо хто адзначае цябе? Што ты маеш, чаго не атрымаў? А калі атрымаў, нашто хвалішся, як
быццам не атрымаў?
8 Вы ўжо насыціліся, ужо сталіся багатымі, бяз нас валадарыце. І калі б вы так валадарылі, каб
і нам з вамі валадарыць!
9 Бо я думаю, што Бог нас, апосталаў, паставіў за апошніх, быццам на сьмерць асуджаных, бо
мы сталіся відовішчам для сьвету, для анёлаў і для людзей.
10 Мы дурныя дзеля Хрыста, а вы мудрыя ў Хрысьце; мы — слабыя, а вы — дужыя; вы —
слаўныя, а мы — без пашаны.
11 Да цяперашняе гадзіны мы галодныя, і сасмаглыя, і голыя, і б'юць нас, і туляемся,
12 і працуем, робячы сваімі рукамі. Зьневажаныя, мы дабраслаўляем; перасьледаваныя, мы
церпім;
13 абражаюць нас, мы молімся; мы сталіся, як адкіды гэтага сьвету, як сьмецьце для ўсіх да
цяпер.
14 Не каб пасароміць вас, пішу гэтае, але як улюбёных дзяцей маіх настаўляю.
15 Бо хаця вы маеце дзесяць тысячаў выхавацеляў у Хрысьце, але няшмат бацькоў, бо я
нарадзіў вас у Хрысьце Ісусе праз Эвангельле.
16 Дык малю вас: будзьце маімі пераймальнікамі.
17 Дзеля гэтага я паслаў да вас Цімафея, які ёсьць дзіця маё ўлюбёнае і вернае ў Госпадзе, які
нагадае вам шляхі мае ў Хрысьце, як я паўсюль у-ва ўсякай царкве навучаю.
18 А як я не прыходжу да вас, некаторыя ўзганарыліся,
19 але я хутка прыйду да вас, калі Госпад захоча, і даведаюся ня словы ганарліўцаў, а сілу,
20 бо Валадарства Божае ня ў слове, але ў сіле.
21 Што хочаце? [Каб я] з кіем прыйшоў да вас ці з любоўю і духам ціхасьці?

1 Кар 5

1 Паўсюль чуваць, што ў вас распуста, і такая распуста, пра якую ня кажуць у паганаў, што
[нехта] мае жонку свайго бацькі.
2 І вы ўзганарыліся, і ня плачаце шмат, каб узяты быў спасярод вас той, хто зрабіў гэткую рэч?
3 Бо я, адсутны целам, але прысутны духам, ужо прысудзіў, як прысутны, таго, хто гэткае
зрабіў,

4 сабраўшыся разам у імя Госпада нашага Ісуса Хрыста і з духам маім, сілаю Госпада нашага
Ісуса Хрыста,
5 аддаць такога шатану на зьнішчэньне цела, каб дух быў збаўлены ў дзень Госпада Ісуса.
6 Няма добрай пахвалы вашай. Хіба вы ня ведаеце, што малая кісьля ўсё цеста квасіць?
7 Дык ачысьціце старую кісьлю, каб быць вам новым цестам, бо вы прэсныя, бо Пасха наша,
Хрыстос, заколены за нас.
8 Так што будзем сьвяткаваць не са старою кісьляю, ня з кісьляй ліхоты і зласьлівасьці, але з
праснакамі шчырасьці і праўды.
9 Я пісаў вам у пасланьні ня мець справы з распусьнікамі.
10 І не наогул з распусьнікамі гэтага сьвету, ці хціўцамі, ці рабаўнікамі, ці ідалапаклоньнікамі,
бо вам трэба было хіба выйсьці з гэтага сьвету,
11 але я пісаў вам цяпер ня мець справы з тым, хто, называючыся братам, ці распусьнік, ці
хцівец, ці ідалапаклоньнік, ці лаяльнік, ці п'яніца, ці рабаўнік; з гэтакім і ня есьці разам!
12 Бо што мне судзіць тых, якія звонку? Ці ня тых, якія пасярод, судзіце вы?
13 А тых, якія звонку, будзе судзіць Бог. Дык выкіньце злыдня спасярод вас.

1 Кар 6

1 Як адважваецца хто з вас, маючы справу з другім, судзіцца перад няправеднымі, а не перад
сьвятымі?
2 Ці вы ня ведаеце, што сьвятыя будуць судзіць сьвет? А калі вамі будзе суджаны сьвет, няўжо
вы ня вартыя судзіць рэчы малыя?
3 Ці вы ня ведаеце, што мы будзем судзіць анёлаў, ня толькі [справы] жыцьцёвыя?
4 А вы, калі маеце судзіцца адносна [справаў] жыцьцёвых, стаўляеце [судзьдзямі] тых, хто
пагарджаны ў царкве.
5 На сорам вам кажу: няўжо няма між вамі ніводнага мудрага, які можа рассудзіць між братамі
сваімі?
6 Але брат з братам судзіцца, і гэта перад бязьвернымі.
7 Дык тое ўжо вялікі ўпадак для вас, што вы маеце суды між сабою. Чаму вам ня лепш быць
пакрыўджанымі? Чаму вам ня лепш мець шкоду?
8 Але вы самі крыўдзіце і абдзіраеце, і гэта братоў!
9 Або вы ня ведаеце, што няправедныя Валадарства Божага ня возьмуць у спадчыну? Не
падманвайце сябе: ані распусьнікі, ані ідалапаклоньнікі, ані чужаложнікі, ані збачэнцы, ані
мужаложнікі,
10 ані злодзеі, ані хціўцы, ані п'яніцы, ані лаяльнікі, ані рабаўнікі ня возьмуць у спадчыну
Валадарства Божага.
11 І гэткімі былі некаторыя, але вы абмытыя, але вы асьвячоныя, але вы апраўданыя ў імя
Госпада нашага Ісуса Хрыста і ў Духу Бога нашага.
12 Усё мне можна, але ня ўсё карысна; усё мне можна, але нішто ня будзе валодаць мною.
13 Ежа для жывата, і жывот для ежы; але Бог зьнішчыць і тое, і другое. Цела ж не для распусты,
але для Госпада, і Госпад — для цела.
14 А Бог і Госпада ўваскрасіў, і нас уваскрасіць сілаю Сваёю.
15 Хіба вы ня ведаеце, што целы вашыя ёсьць члены Хрыстовыя? Дык ці ж, узяўшы члены
Хрыста, зраблю іх членамі распусьніцы? Няхай ня станецца!
16 Або вы ня ведаеце, што той, хто злучаецца з распусьніцаю, ёсьць адно цела [з ёю]? Бо
сказана: "Будуць двое адным целам".
17 А хто злучаецца з Госпадам, ёсьць адзін дух [з Ім].
18 Уцякайце ад распусты. Усякі грэх, які робіць чалавек, ёсьць звонку цела, а распусьнік
грашыць супраць уласнага цела.
19 Або вы ня ведаеце, што цела вашае ёсьць бажніца Духа Сьвятога, Які ў вас, Якога вы маеце
ад Бога, і што вы не свае?
20 Бо вы купленыя дарагою цаною. Таму слаўце Бога ў целе вашым і ў духу вашым, якія ёсьць
Божыя.

1 Кар 7

1 Адносна таго, пра што вы пісалі да мяне, дык добра чалавеку не дакранацца да жанчыны.
2 Але, з увагі на распусту, кожны няхай мае сваю жонку, і кожная няхай мае свайго мужа.
3 Муж няхай аддае жонцы належную зычлівасьць; падобна і жонка мужу.
4 Жонка не валодае сваім целам, але муж; падобна і муж не валодае сваім целам, але жонка.
5 Не ўхіляйцеся адзін ад аднаго, хіба па згодзе, на час, каб быць свабоднымі для посту і малітвы, і зноў у гэтым будзьце разам, каб не спакушаў вас шатан праз няўстрыманасьць вашую.
6 А кажу гэтае як дазвол, а не як загад.
7 Бо хачу, каб усе людзі былі, як і я, але кожны мае свой дар ад Бога, адзін так, другі гэтак.
8 А нежанатым і ўдовам кажу: добра ім, калі застануцца, як я;
9 а калі не ўстрымаюцца, няхай жэняцца, бо лепш ажаніцца, чым распаляцца.
10 Тым жа, што пажаніліся, ня я загадваю, але Госпад: жонцы — не разлучацца з мужам,
11 а калі разлучыцца, няхай застаецца бяз мужа ці няхай пагодзіцца з мужам; і мужу — не пакідаць жонкі.
12 А іншым кажу я, ня Госпад: калі нейкі брат мае жонку бязьверную, і яна згаджаецца жыць з ім, няхай ён не пакідае яе;
13 і жонка, якая мае мужа бязьвернага, і ён згаджаецца жыць з ёю, няхай не пакідае яго.
14 Бо муж бязьверны асьвячаецца ў жонцы, і жонка бязьверная асьвячаецца ў мужу; бо інакш дзеці вашыя былі б нячыстыя, а цяпер яны — сьвятыя.
15 А калі бязьверны разлучаецца, няхай разлучаецца; брат ці сястра ў гэтакіх [выпадках] не прыняволеныя, бо да супакою паклікаў нас Бог.
16 Бо з чаго ты ведаеш, жонка, ці ня збавіш мужа? Або ты, муж, з чаго ведаеш, ці ня збавіш жонку?
17 Толькі кожны няхай ходзіць так, як Бог яму надзяліў, і кожны, як Госпад паклікаў. І гэтак я загадваю ў-ва ўсіх цэрквах.
18 Пакліканы хто абрэзаным? Няхай не хаваецца. Пакліканы хто ў неабразаньні? Няхай не абрэзваецца.
19 Абразаньне ёсьць нішто, і неабразаньне ёсьць нішто, але [важнае] захоўваньне прыказаньняў Божых.
20 Кожны няхай застаецца ў тым пакліканьні, у якім пакліканы.
21 Слугою ты пакліканы? Не табе клапаціцца, але, калі можаш стацца вольным, лепш скарыстайся.
22 Бо слуга, пакліканы ў Госпадзе, ёсьць вызваленец Госпадавы; падобна і той, хто пакліканы вольным, ёсьць слуга Хрыстовы.
23 Вы куплены дарагою цаною; не рабіцеся слугамі людзей.
24 Кожны ў якім [стане] пакліканы, браты, у такім няхай застаецца перад Богам.
25 Адносна дзявоцтва я ня маю загаду ад Госпада, але даю параду, як той, над кім зьлітаваўся Госпад, каб быць яму верным.
26 Дык лічу за добрае дзеля цяперашняе патрэбы, што добра чалавеку гэтак быць.
27 Ты злучаны з жонкаю? Не шукай разводу. Ты вольны ад жонкі? Не шукай жонкі.
28 А калі і ажэнішся, не зграшыш; і калі дзяўчына пойдзе замуж, не зграшыць. Гэткія будуць мець прыгнёт у целе, а я вас шкадую.
29 Але кажу вам, браты: час ужо наблізіўся; таму тыя, што маюць жонак, павінны быць як ня маюць;
30 і тыя, што плачуць, як ня плачуць; і тыя, што радуюцца, як ня радуюцца; і тыя, што купляюць, як не набываюць;
31 і тыя, што карыстаюцца гэтым сьветам, як не карыстаюцца; бо праходзіць выгляд гэтага сьвету.
32 А я хачу, каб вы былі бяз клопату. Нежанаты клапоціцца пра тое, што Госпада, як дагадзіць Госпаду,
33 а жанаты клапоціцца пра тое, што сьвету, як дагадзіць жонцы.

34 Ёсьць розьніца між жонкай і дзяўчынай: незамужняя клапоціцца пра тое, што Госпада, як
дагадзіць Госпаду, каб быць сьвятою і целам, і духам; а замужняя клапоціцца пра тое, што
сьвету, як дагадзіць мужу.
35 А гэта кажу дзеля вашай жа карысьці, не каб накінуць на вас пятлю, але каб вы паважна і
адпаведна [стаялі пры] Госпадзе без перашкодаў.
36 А калі нехта лічыць за непрыстойнае для свае дзяўчыны, каб яна, перацьвіўшы, так і
засталася, няхай робіць, як хоча; [гэтым] не зграшыць, няхай жэняцца.
37 А хто стаў у сэрцы непарушна і, ня маючы патрэбы, але ўладу маючы над воляй сваёй, судзіў
гэтак у сэрцы сваім, каб захаваць сваё дзявоцтва, той добра робіць.
38 Так што хто аддае замуж, добра робіць; а хто не аддае, лепш робіць.
39 Жонка зьвязана законам да таго часу, пакуль жыве ейны муж; а калі муж ейны памрэ, яна
вольная выйсьці замуж за каго хоча, толькі ў Госпадзе.
40 Але яна шчасьлівейшая, калі застанецца так, паводле маёй парады; а я думаю, што і я маю
Духа Божага.

1 Кар 8

1 Адносна ахвяраў ідалам мы ведаем, бо маем усякае веданьне. Але веданьне робіць
ганарыстым, а любоў будуе.
2 А калі хто думае, што ён нешта ведае, той яшчэ нічога не разумее, як трэба разумець.
3 А калі хто любіць Бога, той мае разуменьне ад Яго.
4 Дык адносна ежы, ахвяраванай ідалам, мы ведаем, што ідал у сьвеце — нішто, і што няма
іншага Бога, акрамя Аднаго.
5 Бо хаця і ёсьць гэтак званыя богі, ці ў небе, ці на зямлі, бо ёсьць шмат багоў і шмат гаспадароў,
6 але ў нас адзін Бог Айцец, з Якога ўсё, і мы для Яго; і адзін Госпад Ісус Хрыстос, праз Якога
ўсё, і мы праз Яго.
7 Але не ў-ва ўсіх такое веданьне; некаторыя і дагэтуль з сумленьнем, [якое прызнае] ідалаў,
і ядуць [ахвяраванае ідалам] як ахвяры ідалам, і слабое сумленьне іхняе апаганьваецца.
8 А ежа не набліжае нас да Бога, бо ані калі ямо, не набываем, ані калі не ямо, не губляем.
9 Але глядзіце, каб вашая ўлада ня сталася спатыкненьнем для нядужых.
10 Бо калі хто ўбачыць, што ты, які маеш веданьне, узьлягаеш у паганскай бажніцы, ці
сумленьне яго, як слабога, не збудуецца, каб есьці ахвяры ідалам?
11 І праз тваё веданьне загіне нядужы брат, за якога памёр Хрыстос.
12 А гэтак грэшачы супраць братоў і б'ючы па слабым сумленьні іхнім, вы грашыцё супраць
Хрыста.
13 Дзеля гэтага, калі ежа горшыць брата майго, ня буду есьці мяса давеку, каб ня горшыць
брата майго.

1 Кар 9

1 Ці я не апостал? Ці я ня вольны? Ці я ня бачыў Ісуса Хрыста, Госпада нашага? Ці вы — не мая
справа ў Госпадзе?
2 Калі для другіх я не апостал, але не для вас; бо пячатка майго апостальства — гэта вы ў
Госпадзе.
3 Вось такая мая абарона перад тымі, якія судзяць мяне.
4 Ці мы ня маем улады есьці і піць?
5 Ці ня маем улады хадзіць з сястрою жонкаю, як і пазасталыя апосталы, і браты Госпадавы, і
Кіфа?
6 Ці адзін я і Барнаба ня маем улады не працаваць?
7 Хто калі служыць у войску на свой кошт? Хто садзіць вінаград і ня есьць пладоў яго? Ці хто
пасе статак і ня есьць малака ад статку?
8 Ці толькі па-чалавечаму я гэтае гавару? Ці ня кажа гэтае самае і Закон?

9 Бо ў Законе Майсея напісана: «Не завязвай пысы валу, які малоціць». Ці пра валоў клапоціцца
Бог?
10 Ці дзеля нас наогул гаворыць? Бо дзеля нас напісана, што той, хто арэ, павінен араць з
надзеяй, і той, хто малоціць, [малаціць] з надзеяй атрымаць тое, на што спадзяецца.
11 Калі мы пасеялі ў вас духоўнае, ці вялікая рэч, калі пажнем у вас цялеснае?
12 Калі другія атрымліваюць уладу над вамі, ці ня больш мы? Але мы не скарысталі з гэтае
ўлады, але ўсё вытрымліваем, каб не ўчыніць якое перашкоды Эвангельлю Хрыстоваму.
13 Ці вы ня ведаеце, што тыя, якія пры сьвятым працуюць, ядуць са сьвятыні? Што тыя, якія
паслугуюць пры ахвярніку, бяруць частку ад ахвярніка?
14 Гэтак і Госпад загадаў тым, якія абвяшчаюць Эвангельле, жыць ад Эвангельля.
15 Але я нічым з гэтага не скарыстаўся; напісаў жа гэтае не дзеля таго, каб гэтак было для мяне,
бо для мяне лепш памерці, чым каб хто прынізіў пахвалу маю.
16 Бо, калі я абвяшчаю Эвангельле, няма мне чым хваліцца, бо абавязак ляжыць на мне, і гора
мне, калі я не абвяшчаю Эвангельля.
17 Бо калі я раблю гэтае сваёй ахвотай, маю нагароду, а калі супраць волі, [выконваю]
даверанае гаспадараваньне.
18 Дык якая мая нагарода? Што, дабравесьцячы, бяз платы выкладаю Эвангельле Хрыстовае,
не карыстаючыся маёю ўладаю ў Эвангельлі.
19 Бо, будучы вольным ад усіх, я паняволіў сябе ўсім, каб многіх здабыць.
20 І я стаўся для Юдэяў, як Юдэй, каб здабыць Юдэяў; для тых, якія пад Законам, — як той, што
пад Законам, каб здабыць тых, якія пад Законам;
21 для тых, якія без Закону, — як без Закону, ня будучы без Закону перад Богам, але пад законам
Хрыста, каб здабыць тых, якія без Закону;
22 я стаўся для тых, якія слабыя, як слабы, каб здабыць тых, якія слабыя. Для ўсіх я стаўся ўсім,
каб хоць некага збавіць.
23 А гэта я раблю дзеля Эвангельля, каб стацца ўдзельнікам яго.
24 Ці вы ня ведаеце, што тыя, якія бягуць на стадыёне, бягуць усе, але адзін атрымлівае
ўзнагароду? Дык бяжыце, каб атрымаць.
25 А кожны, хто змагаецца, устрымліваецца ад усяго: тыя — каб атрымаць вянок зьнішчальны,
а мы — незьнішчальны.
26 Дык я бягу, не як на няпэўнае, змагаюся, не як паветра б'ючы,
27 але я вымучваю і няволю цела маё, каб, абвяшчаючы другім, самому ня стацца нявартым.

1 Кар 10

1 Не хачу, браты, каб вы ня ведалі, што бацькі нашыя ўсе былі пад воблакам, і ўсе прайшлі праз
мора,
2 і ўсе ахрысьціліся ў Майсея ў воблаку і ў моры,
3 і ўсе елі тую самую духоўную ежу,
4 і ўсе пілі тое самае духоўнае пітво, бо пілі з духоўнае скалы, якая ішла за імі, а скала гэтая
быў Хрыстос.
5 Але ня многіх з іх упадабаў Бог, бо яны палеглі ў пустыні.
6 А гэта сталася прыкладам для нас, каб мы ня мелі пажаданьня ліха, як пажадалі яны.
7 Ня будзьце таксама ідалапаклоньнікамі, як некаторыя з іх, як напісана: «Народ пасеў есьці і
піць, і ўстаў гуляць».
8 Таксама ня будзем рабіць распусты, як некаторыя з іх распусьнічалі, і ў адзін дзень загінула
дваццаць тры тысячы.
9 Таксама ня будзем спакушаць Хрыста, як некаторыя з іх спакушалі і загінулі ад зьмеяў.
10 Таксама не наракайце, як некаторыя з іх наракалі і загінулі ад нішчыцеля.
11 А ўсё гэтае здарылася з імі ў прыклад і напісана дзеля напамінаньня нам, на якіх канец
вякоў прыйшоў.
12 Так што, хто думае, што стаіць, няхай сьцеражэцца, каб ня ўпасьці.

13 Вас наведала спакуса ня іншая, як чалавечая. Але верны Бог, Які не пакіне вас быць
спакушанымі больш, чым вы можаце [вытрымаць], але са спакусай зробіць і выхад, каб вы
маглі яе перанесьці.
14 Таму, улюбёныя мае, уцякайце ад ідалапаклонства.
15 Кажу, як да мудрых; судзіце самі, што кажу.
16 Келіх дабраслаўленьня, які дабраслаўляем, ці ня ёсьць супольнасьць Крыві Хрыстовае?
Хлеб, які ламаем, ці ня ёсьць супольнасьць Цела Хрыстовага?
17 Як адзін хлеб, так і адно цела мы, многія, бо ўсе мы атрымліваем адзін хлеб.
18 Паглядзіце на Ізраіль паводле цела: ці тыя, якія ядуць ахвяраванае, ня ёсьць супольнікамі
ахвярніка?
19 Дык што я кажу? Ці ідал ёсьць нечым? Ці ахвяра ідалам нечым ёсьць?
20 Але тое, што заколваюць пагане, для дэманаў заколваюць, а не для Бога. А я не хачу, каб вы
сталіся супольнікамі дэманаў.
21 Ня можаце піць келіх Госпада і келіх дэманаў; ня можаце ўдзельнічаць у стале Госпада і
стале дэманаў.
22 Ці будзем раздражняць Госпада? Ці мы дужэйшыя за Яго?
23 Усё мне можна, але ня ўсё карысна; усё мне можна, але ня ўсё будуе.
24 Ніхто няхай не шукае свайго, але кожны таго, што для іншага.
25 Усё, што продаецца на рэзьніцы, ешце, не дасьледуючы дзеля сумленьня,
26 бо Госпадава зямля і што напаўняе яе.
27 А калі хто з бязьверных пакліча вас, і вы захочаце пайсьці, ешце ўсё, што дадуць, нічога не
дасьледуючы дзеля сумленьня.
28 А калі хто скажа вам: «Гэта ахвяра ідалам», — ня ешце дзеля таго, хто паведаміў, і дзеля
сумленьня, бо Госпадава зямля і што напаўняе яе.
29 А пра сумленьне кажу не тваё, але іншага; бо дзеля чаго мая свабода мае быць суджана
чужым сумленьнем?
30 Калі я ў ласцы атрымліваю, навошта блюзьніць на мяне за тое, за што я дзякую?
31 Дык ці ясьцё, ці п'іцё, ці нешта робіце, усё рабіце на славу Божую.
32 Ня станьцеся спатыкненьнем ані для Юдэяў, ані для Грэкаў, ані для царквы Божай,
33 як і я дагаджаю ўсім у-ва ўсім, шукаючы не для сябе карысьці, але для многіх, каб яны былі
збаўленыя.

1 Кар 11

1 Станьцеся пераймальнікамі маімі, як і я — Хрыста.
2 Хвалю вас, браты, што вы ўсё маё памятаеце і трымаецеся традыцыі так, як я перадаў вам.
3 Хачу, каб вы ведалі, што ўсякаму мужу галава Хрыстос, а галава жонцы — муж, а галава
Хрысту — Бог.
4 Усякі муж, які моліцца або прарочыць з накрытаю галавою, сароміць сваю галаву.
5 А ўсякая жанчына, якая моліцца або прарочыць з ненакрытаю галавою, сароміць сваю галаву,
бо гэта тое самае, быццам яна паголеная.
6 Бо, калі жанчына не накрывае галавы, няхай стрыжэцца; а калі жанчыне сорамна стрыгчыся
ці галіцца, няхай накрывае галаву.
7 Бо муж не павінен накрываць галаву, бо ён — вобраз і слава Бога; а жонка ёсьць слава мужа.
8 Бо ня муж ад жонкі, але жонка ад мужа.
9 І ня муж створаны праз жонку, але жонка праз мужа.
10 Дзеля гэтага жонка павінна мець на галаве [знак] улады дзеля анёлаў.
11 Зрэшты, ані муж бяз жонкі, ані жонка бяз мужа, у Госпадзе.
12 Бо як жонка ад мужа, так і муж праз жонку, а ўсе — ад Бога.
13 Судзіце самі ў сабе, ці належыць жанчыне з ненакрытай галавою маліцца Богу?
14 Ці сама прырода ня вучыць вас, што калі мужчына расьціць валасы, гэта ганьба для яго,

15 а калі жанчына расьціць валасы, гэта слава для яе, бо валасы дадзеныя ёй замест адзеньня.
16 А калі хто думае спрачацца, мы ня маем гэткага звычаю, ані цэрквы Божыя.
17 А загадваючы гэтае, не хвалю вас, бо вы зыходзіцеся не на лепшае, але на горшае.
18 Бо, па-першае, чую, што калі вы зыходзіцеся ў царкве, між вамі ёсьць падзел, і я часткова веру,
19 бо мусяць быць між вамі і герэзіі, каб вартыя выявіліся між вамі.
20 Далей, калі вы зыходзіцеся разам, няма [ў вас] спажываньня вячэры Госпада,
21 бо кожны сьпяшаецца зьесьці ўласную вячэру, і адзін [застаецца] галодным, а другі ўпіваецца.
22 Хіба вы дамоў ня маеце, каб есьці і піць? Або пагарджаеце царквою Божаю і сароміце тых, якія ня маюць? Што скажу вам? Ці пахвалю вас за гэтае? Не пахвалю.
23 Бо я ад Госпада прыняў і тое вам перадаў, што Госпад Ісус у тую ноч, калі быў выдадзены, узяў хлеб
24 і, падзякаваўшы, паламаў і сказаў: «Вазьміце, ешце, гэта ёсьць Цела Маё, якое за вас ломіцца. Рабіце гэта на ўспамін пра Мяне».
25 Таксама і келіх пасьля вячэры, кажучы: «Гэты келіх ёсьць Новы Запавет у Крыві Маёй. Гэта рабіце, калі будзеце піць, на ўспамін пра Мяне».
26 Бо кожны раз, калі вы ясьцё хлеб гэты і п'іцё келіх гэты, сьмерць Госпада абвяшчаеце, аж пакуль Ён прыйдзе.
27 Так што хто есьць хлеб гэты ці п'е келіх Госпадавы нягодна, вінны будзе Цела і Крыві Госпада.
28 Няхай жа выпрабоўвае сябе чалавек і гэтак няхай есьць з хлеба гэтага і п'е з келіха гэтага.
29 Бо хто есьць і п'е нягодна, той есьць і п'е прысуд сабе, не раззважаючы пра Цела Госпада.
30 Дзеля гэтага сярод вас шмат слабых і хворых, і даволі памірае.
31 Бо калі мы разважаем пра саміх сябе, ня будзем суджанымі.
32 А калі мы суджаныя, Госпад карае нас, каб не былі мы асуджаныя разам са сьветам.
33 Так што, браты мае, зыходзячыся на вячэру, адзін на аднаго чакайце.
34 А калі хто галодны, няхай есьць дома, каб зьбірацца вам не на асуджэньне. А пра ўсё пазасталае загадаю, калі прыйду.

1 Кар 12

1 Адносна ж духоўных [дароў], браты, не хачу, каб вы ня ведалі.
2 Вы ведаеце, што, калі былі вы паганамі, да ідалаў безгалосых скіроўваліся, быццам вялі вас.
3 Дзеля гэтага паведамляю вам, што ніхто, хто гаворыць у Духу Божым, ня скажа праклёну на Ісуса; і ніхто ня можа назваць Ісуса Госпадам, як толькі ў Духу Сьвятым.
4 Ёсьць адрозьненьні ў дарах, але Дух той самы;
5 і ёсьць адрозьненьні ў служэньнях, але Госпад той самы;
6 і ёсьць адрозьненьні ў дзеяньнях, але Бог той самы, Які ўсё ў-ва ўсіх робіць.
7 А кожнаму даецца выяўленьне Духа дзеля карысьці.
8 Бо аднаму даецца праз Духа слова мудрасьці, а другому — слова веданьня праз таго самага Духа;
9 а іншаму — вера ў тым самым Духу; а іншаму — дары аздараўленьня ў тым самым Духу;
10 іншаму — рабіць цуды, іншаму — прароцтва, іншаму — распазнаваньне духаў, іншаму — разнастайныя мовы, а іншаму — тлумачэньне моваў.
11 А ўсё гэтае робіць адзін і той самы Дух, надзяляючы кожнага асобна, як Ён хоча.
12 Бо як цела адно, але мае шмат членаў, і ўсе члены аднаго цела, хоць іх і шмат, ёсьць адно цела, гэтак і Хрыстос.
13 Бо мы ўсе адным Духам ахрышчаны ў адно цела, ці Юдэі, ці Грэкі, ці слугі, ці вольныя, і ўсе напоены адным Духам.
14 Бо і цела — гэта не адзін член, але шмат.
15 Калі скажа нага: «Як я не рука, я не ад цела», хіба дзеля гэтага яна не ад цела?

16 І калі скажа вуха: «Як я ня вока, я не ад цела», хіба дзеля гэтага яно не ад цела?
17 Калі ўсё цела — вока, дзе слых? Калі ўсё — слых, дзе нюх?
18 Але цяпер Бог разьмясьціў члены, кожны з іх асобна, у целе, як Сам хацеў.
19 А калі б усе былі адзін член, дзе цела?
20 Але цяпер членаў шмат, а цела адно.
21 Ня можа вока сказаць руцэ: «Я ня маю ў табе патрэбы», або таксама галава нагам: «Я ня маю ў вас патрэбы».
22 Але члены цела, якія лічацца слабейшымі, нашмат больш патрэбныя.
23 І тыя, якія нам падаюцца менш пачэснымі ў целе, атачаем асаблівай пашанай, і нашыя непрыстойныя [члены] маюць асаблівую павагу.
24 А нашыя паважаныя [члены] ня маюць [такой] патрэбы. Але Бог спалучыў цела, даўшы тым, якія маюць недахопы, асаблівую пашану,
25 каб не было падзелу ў целе, але члены адзін пра аднаго клапаціліся.
26 І калі церпіць адзін член, церпяць з ім усе члены; калі славіцца адзін член, радуюцца з ім усе члены.
27 Вы ж — Цела Хрыстовае, а паасобна — члены.
28 І адных Бог паставіў у царкве, па-першае, апосталамі, па-другое, прарокамі, па-трэцяе, настаўнікамі; пасьля — [тых, хто мае] сілы, пасьля — дары аздараўленьня, дапамаганьня, гаспадараваньня, разнастайныя мовы.
29 Ці ўсе апосталы? Ці ўсе прарокі? Ці ўсе настаўнікі? Ці ўсе сілы?
30 Ці ўсе маюць дары аздараўленьня? Ці ўсе гавораць мовамі? Ці ўсе тлумачаць?
31 Рупцеся пра дары большыя, і я пакажу вам шлях яшчэ лепшы.

1 Кар 13

1 Калі я гавару мовамі чалавечымі і анёльскімі, а любові ня маю, я — медзь, якая зьвініць, ці цымбалы, якія гудуць.
2 І калі я маю прароцтва, і ведаю ўсе тайны і ўсякае веданьне, і калі маю ўсю веру, каб і горы перастаўляць, а любові ня маю, я — нішто.
3 І калі я раздам усю маёмасьць маю, і аддам цела маё на спаленьне, а любові ня маю, няма мне ніякае карысьці.
4 Любоў доўга церпіць, робіць дабро; любоў не зайздросьціць; любоў не вывышаецца, не надзімаецца,
5 ня робіць непрыстойнага, не шукае свайго, ня гневаецца, ня думае ліхога,
6 ня радуецца з няправеднасьці, але цешыцца з праўды;
7 усё вытрымлівае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё трывае.
8 Любоў ніколі ня зьнікне, калі нават прароцтвы зьнікнуць, калі мовы змоўкнуць, калі веданьне зьнішчыцца.
9 Бо мы часткова ведаем і часткова прарочым;
10 а калі прыйдзе дасканалае, тады тое, што частковае, зьнікне.
11 Калі я быў немаўлём, як немаўлятка гаварыў, як немаўлятка думаў; а калі стаўся мужам, пакінуў тое, што немаўляці.
12 Бо цяпер мы бачым праз [мутнае] шкло, невыразна; а тады — аблічча да аблічча; цяпер я разумею часткова, а тады пазнаю [гэтаксама], як я сам пазнаны.
13 А цяпер застаюцца вера, надзея, любоў — гэтыя тры; але большая з іх — любоў.

1 Кар 14

1 Імкніцеся да любові; і рупцеся пра [дары] духоўныя, асабліва пра тое, каб прарочыць.
2 Бо хто гаворыць [незнаёмай] моваю, той гаворыць ня людзям, але Богу; бо ніхто ня чуе, [як] ён тайны духам гаворыць.
3 А хто прарочыць, той гаворыць людзям на збудаваньне, і на заахвочваньне, і на пацяшэньне.
4 Хто гаворыць [незнаёмай] моваю, збудоўвае сябе; а хто прарочыць, царкву збудоўвае.

5 Хачу, каб вы ўсе гаварылі мовамі, але больш, каб вы прарочылі, бо той, хто прарочыць,
большы за таго, хто гаворыць мовамі, хіба што ён будзе і тлумачыць, каб царква атрымала
збудаваньне.
6 Цяпер, як я прыйду да вас, браты, гаворачы мовамі, якая вам карысьць, калі ня буду гаварыць
да вас ці з адкрыцьцём, ці з веданьнем, ці з прароцтвам, ці з навучаньнем?
7 Падобна і бяздушныя [рэчы], якія голас даюць, ці жалейка, ці гусьлі, калі не даюць
разьдзельнасьці гукаў, як даведацца, што граюць на жалейцы ці граюць на гусьлях?
8 І калі труба будзе даваць невыразны голас, хто пачне рыхтавацца да бітвы?
9 Гэтак і вы, калі языком не вымавіце выразнае слова, як зразумеюць, што вы гаворыце? Бо вы
будзеце гаварыць на вецер.
10 Колькі, напрыклад, разнастайных моваў у сьвеце, і ніводнае бяз голасу.
11 Дык калі я ня ведаю значэньня мовы, буду чужынцам для таго, хто гаворыць, і той, хто
гаворыць, [будзе] для мяне чужынец.
12 Гэтак і вы, калі рупіцеся пра [дары] духоўныя, шукайце, каб набываць іх дзеля збудаваньня
царквы.
13 Дзеля гэтага той, хто гаворыць [незнаёмай] моваю, няхай моліцца, каб тлумачыць.
14 Бо, калі я малюся [незнаёмай] моваю, дух мой моліцца, а розум мой бяз плоду.
15 Дык што? Буду маліцца духам, буду маліцца і розумам; буду сьпяваць духам, буду сьпяваць
і розумам.
16 Бо калі ты будзеш дабраслаўляць духам, як той, хто стаіць на месцы [чалавека] простага,
скажа «Амэн» на тваю падзяку, бо ён ня ведае, што ты гаворыш.
17 Бо ты добра дзякуеш, але іншы не збудоўваецца.
18 Дзякую Богу майму, больш за ўсіх вас гаворачы мовамі,
19 але ў царкве хачу лепш сказаць пяць словаў розумам маім, каб і другіх навучыць, чым
дзясяткі тысячаў словаў на [незнаёмай] мове.
20 Браты! Ня будзьце дзецьмі розумам; на благое будзьце немаўлятамі, а розумам будзьце
дасканалымі.
21 У Законе напісана: «Іншымі мовамі і іншымі вуснамі буду гаварыць да народу гэтага, але і
тады не паслухаюць Мяне, — кажа Госпад».
22 Так што мовы ёсьць на знак не для тых, якія вераць, але для бязьверных; а прароцтва не для
бязьверных, але для тых, якія вераць.
23 Дык калі ўся царква зыйдзецца разам, і ўсе будуць гаварыць мовамі, а ўвойдуць да вас
[людзі] простыя ці бязьверныя, ці ня скажуць яны, што вы вар'яцееце?
24 А калі ўсе прарочаць, і ўвойдзе нейкі чалавек бязьверны ці просты, дык усімі ён дакараны,
усімі суджаны,
25 і гэтак таямніцы сэрца ягонага выяўляюцца, і ён, упаўшы на аблічча, паклоніцца Богу,
паведамляючы: «Праўдзіва, з вамі Бог!»
26 Дык што, браты? Калі вы зыходзіцеся, кожны з вас мае псальм, мае навучаньне, мае
[незнаёмую] мову, мае адкрыцьцё, мае тлумачэньне; усё няхай будзе на збудаваньне.
27 Калі хто гаворыць [незнаёмай] моваю, [гаварыце] па двое ці, найбольш, па трое, і па чарзе,
і адзін няхай тлумачыць.
28 А калі няма тлумача, няхай маўчыць у царкве, а гаворыць сабе і Богу.
29 І прарокі няхай гавораць двое ці трое, а іншыя няхай разважаюць.
30 А калі іншаму з тых, якія сядзяць, [нешта] адкрыецца, першы няхай маўчыць.
31 Бо ўсе адзін за адным можаце прарочыць, каб усе былі навучаныя і ўсе былі суцешаныя.
32 І духі прарочыя паслухмяныя прарокам,
33 бо Бог ня ёсьць [Бог] бязладзьдзя, але супакою, як у-ва ўсіх цэрквах у сьвятых.
34 Жанчыны вашыя ў цэрквах няхай маўчаць; бо не дазволена ім гаварыць, але каб былі
паслухмяныя, як і Закон кажа.
35 А калі хочуць нечаму навучыцца, няхай пытаюцца дома ў мужоў сваіх, бо сорамна
жанчынам гаварыць у царкве.

36 Ці ад вас выйшла слова Божае? Або ці да вас адных прыйшло?
37 Калі хто лічыць, што ён прарок ці духоўны, той няхай ведае, што тое, што я пішу вам, ёсьць прыказаньні Госпадавы.
38 А калі хто не разумее, няхай не разумее.
39 Так што, браты, рупцеся, каб прарочыць, і не забараняйце гаварыць мовамі.
40 Усё няхай будзе прыстойна і парадкам.

1 Кар 15

1 Паведамляю вам, браты, Эвангельле, якое я дабравесьціў вам, і якое вы прынялі, і ў якім стаіцё,
2 і праз якое збаўляецеся, калі будзеце трымацца таго слова, якое я дабравесьціў вам, калі толькі не надарма паверылі.
3 Бо я найперш перадаў вам тое, што і сам прыняў, што Хрыстос памёр за грахі нашыя паводле Пісаньняў,
4 і што Ён быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісаньняў,
5 і што Ён зьявіўся Кіфе, а пасьля — Дванаццаці,
6 пасьля зьявіўся больш чым пяцістам братам за раз, з якіх многія дагэтуль жывуць, а некаторыя паўміралі;
7 пасьля зьявіўся Якубу, пасьля — усім апосталам,
8 а апошняму з усіх зьявіўся і мне, быццам неданоску.
9 Бо я — найменшы з апосталаў, які ня варты называцца апосталам, бо я перасьледаваў царкву Божую,
10 але з ласкі Бога ёсьць тым, кім ёсьць, і ласка Ягоная ў-ва мне не была дарэмнай, але я больш за іх усіх працаваў; дый ня я, але ласка Божая, якая са мною.
11 Дык ці я, ці яны, мы гэтак абвяшчаем, і вы гэтак паверылі.
12 А калі пра Хрыста абвяшчаецца, што Ён уваскрос з мёртвых, як некаторыя з вас кажуць, што няма ўваскрасеньня мёртвых?
13 Калі няма ўваскрасеньня мёртвых, дык і Хрыстос не ўваскрос;
14 а калі Хрыстос не ўваскрос, тады дарэмнае і абвяшчэньне нашае, дарэмная і вера вашая.
15 А нас знайшлі б фальшывымі сьведкамі Божымі, бо мы сьведчылі пра Бога, што Ён уваскрасіў Хрыста, Якога не ўваскрашаў, калі мёртвыя не ўваскрасаюць.
16 Бо калі мёртвыя не ўваскрасаюць, дык і Хрыстос не ўваскрос;
17 а калі Хрыстос не ўваскрос, дык вера вашая марная, вы яшчэ ў грахах вашых.
18 Таму і тыя, якія памерлі ў Хрысьце, загінулі.
19 Калі мы толькі ў гэтым жыцьці спадзяемся на Хрыста, мы найбольш жалю вартыя з усіх людзей.
20 Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, стаўся Першынцам сярод памёршых.
21 Бо як праз чалавека сьмерць, гэтак праз чалавека і ўваскрасеньне мёртвых.
22 Бо як у Адаме ўсе паміраюць, гэтак у Хрысьце ўсе ажывуць,
23 але кожны — у сваім парадку: Першынец — Хрыстос, пасьля — Хрыстовыя ў прыйсьце Ягонае,
24 а пасьля — канец, калі Ён перадасьць Валадарства Богу і Айцу, калі зьнішчыць усякае начальства, і ўсякую ўладу і сілу,
25 бо Яму належыць валадарыць, пакуль пакладзе ўсіх ворагаў пад ногі Свае.
26 Апошні вораг будзе зьнішчаны — сьмерць,
27 бо ўсё падпарадкаваў пад ногі Яго. А калі сказана, што ўсё падпарадкавана, зразумела, што акрамя Таго, Які падпарадкаваў Яму ўсё.
28 А калі ўсё будзе падпарадкавана Яму, тады і Сам Сын падпарадкуецца Таму, Які падпарадкаваў Яму ўсё, каб быў Бог усё ў-ва ўсім.
29 Іначай, што будуць рабіць тыя, якія хрысьцяцца дзеля мёртвых? Калі мёртвыя зусім не ўваскрасаюць, навошта хрысьціцца дзеля мёртвых?

30 Навошта і мы ўсякую гадзіну ў небясьпецы?
31 Я штодня паміраю, сцьвяржае гэта пахвала вашая, якую маю ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым.
32 Калі б я па-чалавечаму змагаўся са зьвярамі ў Эфэсе, якая мне карысьць, калі мёртвыя не ўваскрасаюць? «Будзем есьці і піць, бо заўтра памром!»
33 Не падманвайце сябе: благія таварыствы псуюць добрыя звычаі.
34 Працьверазіцеся на праведнасьць і не грашыце; бо некаторыя [з вас] ня ведаюць Бога, на сорам вам кажу.
35 Але скажа нехта: «Як уваскрэснуць мёртвыя? Ды ў якім целе прыйдуць?»
36 Неразумны! Тое, што ты сееш, не ажыве, калі не памрэ.
37 І тое, што сееш, сееш ня цела, якое будзе, але голае зерне, можа, пшанічнае, ці якое іншае,
38 а Бог дае яму цела, як хоча, і кожнаму насеньню — сваё цела.
39 Ня ўсякае цела такое самае цела, але адно цела ў людзей, а іншае цела ў жывёлаў, іншае ў рыбаў, іншае ў птушак.
40 І [ёсьць] целы нябесныя, і целы зямныя; але адна слава нябесных, а другая — зямных,
41 іншая слава сонца, і іншая слава месяца, і іншая слава зорак, бо зорка ад зоркі розьніцца ў славе.
42 Гэтак і ўваскрасеньне мёртвых: сеецца ў сапсутасьці, уваскрашаецца ў незьнішчальнасьці;
43 сеецца ў ганьбе, уваскрашаецца ў славе; сеецца ў нядужасьці, уваскрашаецца ў моцы;
44 сеецца цела душэўнае, уваскрашаецца цела духоўнае. Ёсьць цела душэўнае, і ёсьць цела духоўнае.
45 Гэтак і напісана: «Стаўся першы чалавек Адам душою жывою», а апошні Адам — дух, які ажыўляе.
46 Але спачатку не духоўнае, але душэўнае; духоўнае пасьля.
47 Першы чалавек — з зямлі, зямны; другі Чалавек — Госпад з неба.
48 Які зямны, гэтакія і зямныя; і які Нябесны, гэтакія і нябесныя.
49 І як мы насілі вобраз зямнога, будзем насіць і вобраз Нябеснага.
50 А тое скажу, браты, што ня могуць цела і кроў успадкаеміць Валадарства Божага, і сапсутасьць не ўспадкаеміць незьнішчальнасьці.
51 Вось, кажу вам тайну: ня ўсе мы памром, але ўсе пераменімся,
52 у адзін момант, у імгненьне вока, пры апошняй трубе; бо затрубіць, і мёртвыя ўваскрэснуць незьнішчальнымі, і мы пераменімся.
53 Бо зьнішчальнае гэтае мусіць апрануцца ў незьнішчальнасьць, і сьмяротнае гэтае — апрануцца ў несьмяротнасьць.
54 А калі зьнішчальнае гэтае апранецца ў незьнішчальнасьць, і сьмяротнае гэтае апранецца ў несьмяротнасьць, тады станецца напісанае слова: «Паглынутая сьмерць перамогаю».
55 «Сьмерць, дзе тваё джала? Пекла, дзе твая перамога?»
56 Джала сьмерці — грэх, а сіла грэху — закон.
57 Падзяка ж Богу, Які даў нам перамогу праз Госпада нашага Ісуса Хрыста!
58 Так што, браты мае ўлюбёныя, будзьце непарушныя, непахісныя, у справе Госпадавай мейце рупнасьць заўсёды, ведаючы, што праца вашая не дарэмная перад Госпадам.

1 Кар 16

1 А адносна складак, якія для сьвятых, рабіце і вы так, як я загадаў цэрквам Галяцкім:
2 у першы [дзень] пасьля суботы кожны з вас няхай складае ў сябе і зьбірае паводле таго, як яму вядзецца, каб не рабіць складак тады, калі я прыйду.
3 А калі я прыйду, пашлю тых, якіх вы вызначыце праз лісты, занесьці дар ваш у Ерусалім.
4 А калі будзе варта і мне пайсьці, яны пойдуць са мною.
5 Я ж прыйду да вас, калі прайду Македонію, бо праз Македонію праходжу.
6 А ў вас, можа быць, затрымаюся, або і перазімую, каб вы мяне праводзілі, куды я пайду.

7 Бо не хачу бачыць вас цяпер мімаходам, але спадзяюся застацца нейкі час з вамі, калі Госпад
дазволіць.
8 А ў Эфэсе я застануся да Пяцідзясятніцы,
9 бо для мяне адчыненыя вялікія і зручныя дзьверы і шмат супраціўнікаў.
10 Калі ж прыйдзе Цімафей, глядзіце, каб быў у вас бяз страху; бо ён справу Госпада выконвае,
як і я.
11 Дык няхай ніхто не пагарджае ім, а правядзіце яго ў супакоі, каб ён прыйшоў да мяне, бо я
чакаю яго з братамі.
12 Што да брата Апалёса, дык я шмат прасіў яго, каб ён прыйшоў да вас з братамі; ды ён зусім
ня меў ахвоты, каб прыйсьці цяпер, але прыйдзе, калі будзе мець час.
13 Чувайце, стойце ў веры, будзьце мужнымі, умацоўвайцеся.
14 Усё ў вас няхай будзе ў любові.
15 Прашу ж вас, браты: вы ведаеце дом Стэфана, што ён ёсьць пачатак Ахаі і што яны аддалі
сябе на служэньне сьвятым;
16 дык і вы будзьце паслухмяныя гэтакім і кожнаму, хто дапамагае нам і працуе.
17 Я радуюся з прыходу Стэфана, і Фартуната, і Ахаіка, што яны дапоўнілі вашую нястачу,
18 бо яны супакоілі дух мой і ваш. Дык зважайце на такіх.
19 Вітаюць вас цэрквы Азійскія. Вітаюць вас шчыра ў Госпадзе Акіла і Прыскіла з царквою, якая
ў іх доме.
20 Вітаюць вас усе браты. Прывітайце адзін аднаго пацалункам сьвятым.
21 Прывітаньне маёй рукою, Паўлавай.
22 Калі хто ня любіць Госпада Ісуса Хрыста, няхай будзе адлучаны! Прыходзіць наш Госпад!
23 Ласка Госпада Ісуса Хрыста з вамі.
24 Любоў мая з усімі вамі ў Хрысьце Ісусе. Амэн.

ДРУГОЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА КАРЫНЬЦЯНАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, з волі Божай апостал Ісуса Хрыста, і Цімафей, брат, — царкве Божай, што ў Карыньце,
з усімі сьвятымі, якія ў-ва ўсёй Ахаі:
2 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
3 Дабраслаўлёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Айцец міласэрнасьці і Бог усякага
пацяшэньня,
4 Які пацяшае нас у кожным прыгнёце нашым, каб мы маглі пацяшаць тых, якія ў-ва ўсялякім
прыгнёце, пацяшэньнем, якім Бог пацяшае нас!
5 Бо як памнажаюцца ў нас пакуты Хрыстовыя, гэтак праз Хрыста памнажаецца і пацяшэньне
нашае.
6 А калі мы сьціснутыя, дык дзеля вашага пацяшэньня і збаўленьня, якое зьдзяйсьняецца праз
перажываньне тых самых пакутаў, якія і мы церпім. Калі мы пацешаныя, дык дзеля вашага
пацяшэньня і збаўленьня.
7 І надзея нашая на вас цьвёрдая, бо мы ведаем, што вы супольнікі як пакутаў, так і
пацяшэньня.
8 Бо мы ня хочам, каб вы, браты, ня ведалі пра наш прыгнёт, які стаўся нам у Азіі, бо бязьмерна
цяжка было нам і па-над сілу, так што мы згубілі надзею застацца жывымі.
9 Але мы мелі самі ў сабе прысуд сьмяротны, каб спадзявацца не на саміх сябе, але на Бога,
Які ўваскрашае мёртвых,
10 Які і выбавіў нас ад так вялікай сьмерці, і выбаўляе, на Якога спадзяемся, што і яшчэ
выбаўляць будзе
11 пры дапамозе і вашай малітвы за нас, каб за дараванае нам па просьбе многіх дзякавалі за
нас многія.
12 Бо пахвала нашая гэткая — сьведчаньне сумленьня нашага, што мы ў прастаце і шчырасьці
Божай, не ў цялеснай мудрасьці, але ў ласцы Божай жылі ў сьвеце, а асабліва ў вас.
13 Бо мы пішам вам ня што іншае, але тое, што вы чытаеце ці пазнаяцё, а спадзяюся, што да
канца спазнаеце,
14 як вы часткова і даведаліся ад нас, што мы — пахвала вашая, як і вы — нашая, у дзень Госпада
Ісуса.
15 І з гэтай пэўнасьцю я хацеў прыйсьці да вас раней, каб вы другі раз мелі ласку,
16 і праз вас прайсьці ў Македонію, і зноў з Македоніі прыйсьці да вас, а вы правялі б мяне ў
Юдэю.
17 Маючы гэткую пастанову, ці я лёгкадумна зрабіў? Ці тое, што я пастанаўляю, паводле цела
пастанаўляю, каб было ў мяне «Так, так» і «Не, не»?
18 Верны ж Бог, што слова нашае да вас не было «Так» і «Не»!
19 Бо Сын Божы, Ісус Хрыстос, Якога мы ў вас абвяшчалі, і я, і Сілуан, і Цімафей, ня быў «Так»
і «Не», але было ў Ім «Так».
20 Бо ўсе абяцаньні Божыя ў Ім «Так» і ў Ім «Амэн», на славу Богу праз нас.
21 А Той, Які зацьвердзіў нас з вамі ў Хрысьце і памазаў нас, ёсьць Бог,
22 Які і запячатаў нас, і даў заруку Духа ў сэрцы нашыя.
23 Прызываю Бога ў сьведкі на душу маю, што, шкадуючы вас, я дагэтуль не прыйшоў у Карынт;
24 не таму, што мы пануем над вераю вашай, але мы супрацоўнікі ў радасьці вашай, бо ў веры
вы стаіцё.

2 Кар 2

1 Але я судзіў у сабе не прыходзіць да вас ізноў у смутку,
2 бо, калі я засмучаю вас, хто разьвяселіць мяне, як ня той, хто засмучаны мною?
3 І я пісаў вам гэта, каб, прыйшоўшы, ня мець смутку ад тых, ад якіх я мусіў мець радасьць. Я
маю пэўнасьць адносна ўсіх вас, што мая радасьць — для ўсіх вас [радасьць].

4 Бо з вялікага прыгнёту і ўціску сэрца пісаў я вам з многімі сьлязьмі, не каб вы былі
засмучаныя, але каб спазналі любоў, якую я з лішкам маю да вас.
5 А калі хто засмуціў, не мяне засмуціў, але часткова, каб [яго] не абцяжарваць, усіх вас.
6 Даволі гэткаму самога дакараньня ад большасьці;
7 так што лепш ужо вам дараваць [яму] і суцешыць, каб гэтакі ня быў ахоплены смуткам
празьмерным.
8 Дзеля гэтага загадваю вам засьведчыць яму любоў.
9 Бо дзеля гэтага я і пісаў, каб выпрабаваць вас, ці ў-ва ўсім вы паслухмяныя.
10 А каму вы што даруеце, таму і я; бо і я, калі што дараваў каму, дараваў дзеля вас перад
абліччам Хрыста,
11 каб не ашукаў нас шатан; бо нам вядомыя думкі ягоныя.
12 Калі ж я прыйшоў у Трааду дзеля Эвангельля Хрыстовага і дзьверы былі мне адчыненыя ў
Госпадзе,
13 я ня меў патолі духу майму, не знайшоўшы Ціта, брата майго, але, разьвітаўшыся з імі,
пайшоў у Македонію.
14 Падзяка ж Богу, Які заўсёды дае нам трыюмфаваць у Хрысьце, і водар веданьня пра Сябе
выяўляе праз нас у-ва ўсякім месцы.
15 Бо мы — слодыч Хрыстовая для Бога ў тых, якія збаўленыя, і ў тых, якія гінуць.
16 Для адных — водар сьмерці на сьмерць, а для другіх — водар жыцьця на жыцьцё. І хто здатны
на гэта?
17 Бо мы не фальшуем слова Божае, як многія, але гаворым у шчырасьці, як ад Бога, перад
Богам у Хрысьце.

2 Кар 3

1 Ці пачнем ізноў адрэкамэндоўваць сябе [вам]? Ці мы патрабуем, як некаторыя, даручальных
лістоў да вас ці даручальных [лістоў] ад вас?
2 Вы — наш ліст, напісаны ў сэрцах нашых, які ведаюць і чытаюць усе людзі.
3 Бо яўна [для ўсіх], што вы — ліст Хрыстовы, напісаны праз служэньне нашае не атрамантам,
але Духам Бога Жывога, не на каменных табліцах, але на цялесных табліцах сэрца.
4 А гэтакую пэўнасьць мы маем у Богу праз Хрыста
5 не таму, што мы здольныя залічыць нешта сабе, нібыта праз сябе, але здольнасьць нашая ад
Бога,
6 Які даў нам здольнасьць быць служыцелямі Новага Запавету, ня літары, але духа, бо літара
забівае, а дух ажыўляе.
7 Калі ж служэньне сьмерці, высечанае літарамі на камянях, было ў такой славе, што сыны
Ізраіля не маглі глядзець на аблічча Майсея дзеля славы аблічча ягонага, якая зьнікала,
8 дык ці ня шмат больш будзе ў славе служэньне Духа?
9 Бо калі служэньне асуджэньня ёсьць слава, шмат больш багатае славаю служэньне
праведнасьці.
10 Бо і тое, што мела славу, не было слаўным у сваёй меры з прычыны бязьмернасьці [будучай]
славы.
11 Бо калі мае славу тое, што зьнікае, тым больш у славе тое, што застаецца.
12 Дык, маючы гэткую надзею, дзейнічаем з вялікай адвагаю.
13 І ня так, як Майсей, які ўскладаў заслону на аблічча сваё, каб сыны Ізраіля не глядзелі на
канец таго, што зьнікае.
14 Але скамянелі думкі іхнія, бо тая заслона да сёньня застаецца нязьнятай пры чытаньні
Старога Запавету, таму што яна ў Хрысьце зьнішчаецца.
15 Аж да сёньня, калі яны чытаюць Майсея, заслона ляжыць на сэрцы іхнім,
16 а калі хто зьвернецца да Госпада, заслона здымаецца.
17 Госпад ёсьць Дух, а дзе Дух Госпада, там свабода.
18 Мы ж усе, адкрытым абліччам узіраючыся на славу Госпада, перамяняемся ў вобраз Ягоны
ад славы ў славу, як ад Духа Госпада.

2 Кар 4

1 Дзеля гэтага, маючы такое служэньне, бо мы атрымалі літасьць, мы не журымся,
2 але адмаўляемся тайных [учынкаў] сораму, ня ходзячы падступна і не перакручваючы Слова
Божага, але выяўленьнем праўды адрэкамэндоўваем сябе сумленьню кожнага чалавека перад
Богам.
3 А калі і закрытае Эвангельле нашае, закрыта для тых, якія гінуць,
4 для бязьверных, у якіх бог веку гэтага засьляпіў думкі, каб не ўзыйшло ім сьвятло Эвангельля
славы Хрыста, Які ёсьць вобраз Божы.
5 Бо мы не саміх сябе абвяшчаем, але Хрыста Ісуса, Госпада; а мы — слугі вашыя дзеля Ісуса.
6 Таму што Бог, Які сказаў з цемры зазьзяць сьвятлу, Сам зазьзяў у сэрцах нашых дзеля
прасьвятленьня [нас] пазнаньнем славы Божае ў абліччы Ісуса Хрыста.
7 А скарб гэты мы маем у гліняных начыньнях, каб празьмернасьць моцы была ад Бога, а ня з
нас.
8 Мы ў-ва ўсім уцісканыя, але ня сьціснутыя; мы зьбянтэжаныя, але не губляем надзеі;
9 мы перасьледаваныя, але не пакінутыя; мы паваленыя, але ня гінем.
10 Мы заўсёды носім у целе мёртвасьць Госпада Ісуса, каб і жыцьцё Ісуса выявілася ў целе
нашым.
11 Бо мы, жывыя, заўсёды выдаваныя на сьмерць дзеля Ісуса, каб і жыцьцё Ісуса выявілася ў
сьмяротным целе нашым.
12 Так што сьмерць дзейнічае ў нас, а жыцьцё — у вас.
13 А маючы той самы дух веры, як напісана: «Я верыў і дзеля гэтага гаварыў», і мы верым і
дзеля гэтага гаворым,
14 ведаючы, што Той, Які ўваскрасіў Госпада Ісуса, уваскрасіць праз Ісуса і нас і паставіць разам
з вамі.
15 Бо ўсё дзеля вас, каб багацьце ласкі праз шматлікія падзякі памнажалася на славу Божую.
16 Дзеля гэтага мы не журымся, але, калі наш вонкавы чалавек зьнішчаецца, дык унутраны
дзень пры дні абнаўляецца.
17 Бо гэты караценькі лёгкі прыгнёт наш робіць яшчэ большай і большай вагу славы вечнае для
нас,
18 якія глядзім не на бачнае, але на нябачнае, бо бачнае — часовае, а нябачнае — вечнае.

2 Кар 5

1 Бо мы ведаем, што калі зямны наш дом, хаціна, зруйнуецца, мы маем пабудову ад Бога, дом,
які не рукамі зроблены, вечны ў небе.
2 Бо дзеля гэтага мы і ўздыхаем, жадаючы апрануцца ў нашае жытло з неба,
3 каб мы знайшлі сябе апранутымі, а ня голымі.
4 Бо мы, знаходзячыся ў хаціне, уздыхаем пад цяжарам, бо ня хочам пазбыцца [яе], але
апрануцца, каб сьмяротнае ахоплена было жыцьцём.
5 На гэта самае і стварыў нас Бог, і даў нам заруку Духа.
6 Дык мы заўсёды маем пэўнасьць і ведаем, што, жывучы ў целе, жывем па-за Госпадам.
7 Бо мы ходзім вераю, а ня бачаньнем.
8 Дык мы маем пэўнасьць і жадаем лепей жыць па-за целам і жыць у Госпадзе.
9 Дзеля гэтага мы намагаемся, ці жывучы ў Ім, ці па-за Ім, быць даспадобы Яму.
10 Бо ўсе мы мусім зьявіцца перад судовы пасад Хрыста, каб кожны атрымаў за тое, што ён
учыніў, будучы ў целе, ці добрае, ці благое.
11 Дык, ведаючы страх Госпадавы, мы пераконваем людзей, а для Бога мы яўныя, і спадзяюся,
што і для вашых сумленьняў яўныя.
12 Бо мы не адрэкамэндоўваем сябе вам зноў, але даем вам нагоду хваліцца намі, каб мелі вы
[адказ] для тых, якія хваляцца абліччам, а ня сэрцам.
13 Бо калі мы дзівачэем, дык дзеля Бога; калі пры розуме, дык дзеля вас.
14 Бо любоў Хрыстова панукае нас, якія гэтак пастанавілі, што калі адзін памёр за ўсіх, дык усе
памерлі.

15 І Ён памёр за ўсіх, каб тыя, якія жывуць, больш не дзеля сябе жылі, але дзеля Таго, Які памёр
за іх і ўваскрос.
16 Так што мы адгэтуль нікога ня ведаем паводле цела; а калі і ведалі Хрыста паводле цела,
дык цяпер ужо ня ведаем.
17 Так што хто ў Хрысьце, той новае стварэньне; старое мінула, вось, сталася ўсё новае.
18 Усё ж ад Бога, Які праз Ісуса Хрыста пагадзіў нас з Сабою і даў нам служэньне прымірэньня.
19 Бо Бог быў у Хрысьце, пагаджаючы з Сабою сьвет, не залічваючы ім праступкаў іхніх, і ўклаў
у нас слова прымірэньня.
20 Дык мы спаўняем пасольства замест Хрыста, як бы Сам Бог просіць праз нас; за Хрыста
просім: «Пагадзіцеся з Богам».
21 Бо Таго, Які грэху ня ведаў, Ён зрабіў за нас грэхам, каб мы ў Ім сталіся праведнасьцю Божай.

2 Кар 6

1 І працуючы разам [з Ім], мы просім, каб ласка Божая не надарма была атрыманая вамі.
2 Бо Ён кажа: «У час прыемны Я выслухаў цябе і ў дзень збаўленьня дапамог табе». Вось, цяпер
час адпаведны, вось, цяпер дзень збаўленьня!
3 Мы нікому ні ў чым не даем спатыкненьня, каб ня ганілася служэньне,
4 але ў-ва ўсім адрэкамэндоўваем вам сябе, як служыцеляў Божых, у вялікай цярплівасьці, у
прыгнётах, у патрэбах, у ўцісках,
5 у зьбіцьці, у вязьніцах, у забурэньнях, у працах, у чуваньнях, у пастах,
6 у чысьціні, у веданьні, у доўгацярплівасьці, у ласкавасьці, у Духу Сьвятым, у любові
некрывадушнай,
7 у слове праўды, у моцы Божай, са зброяй праведнасьці ў правай і ў левай руцэ,
8 у славе і ганьбе, у ганьбаваньні і пахвале; нібы падманшчыкі, але праўдзівыя,
9 як невядомыя, але пазнаваныя; як тыя, што паміраюць, але, вось, мы жывыя; як караныя, але
не забіваныя;
10 як засмучаныя, але заўсёды радасныя; як убогія, але многіх узбагачаем; як нічога ня маем,
але ўсім валодаем.
11 Вусны нашыя расчыніліся да вас, Карыньцяне, сэрца нашае пашырылася.
12 Вам ня цесна ў нас, але ў сэрцах вашых цесна.
13 Дзеля гэткае ж платы кажу [вам], як дзецям, пашырцеся і вы.
14 Ня будзьце пад чужым ярмом з бязьвернымі, бо якое таварыства праведнасьці і
беззаконьня? Якая супольнасьць у сьвятла з цемраю?
15 А якая згода ў Хрыста з Бэліярам? Ці якая частка ў вернага з бязьверным?
16 Ці якая лучнасьць у бажніцы Божай з ідаламі? Бо вы — бажніца Бога Жывога, як сказаў Бог:
«Буду жыць у іх і буду хадзіць з імі; і буду іхнім Богам, і яны будуць Маім народам».
17 Дзеля гэтага: «Выйдзіце спасярод іх і аддзяліцеся, — кажа Госпад, — і не дакранайцеся да
нячыстага, і Я прыйму вас».
18 «І Я буду вам Айцом, і вы будзеце Мне сынамі і дочкамі, — кажа Госпад Усеўладны».

2 Кар 7

1 Дык, улюбёныя, маючы такія абяцаньні, ачысьцім сябе ад усякага бруду цела і духа,
зьдзяйсьняючы сьвятыя рэчы ў страху Божым.
2 Зьмясьціце нас. Мы нікога не пакрыўдзілі, нікому не пашкодзілі, нікога не ашукалі.
3 Не на асуджэньне кажу, бо я раней сказаў, што вы ў сэрцах нашых, каб разам і памерці, і
жыць.
4 Вялікая ў мяне адвага што да вас, вялікая мне пахвала за вас; я напоўнены пацяшэньнем,
маю ўдосталь радасьці ў-ва ўсякім прыгнёце нашым.
5 Бо калі мы прыйшлі ў Македонію, цела нашае ня мела патолі, але ў-ва ўсім мы былі
прыгнечаныя: звонку — звадкі, унутры — страхі.
6 Але Бог, Які суцяшае пакорных, суцешыў нас прыходам Ціта.

7 І ня толькі прыходам яго, але і пацяшэньнем, якім ён суцешыўся праз вас, расказваючы нам
пра вашае жаданьне, пра ваш лямант, пра вашую руплівасьць адносна мяне, так што я яшчэ
больш радаваўся.
8 Дык калі я і засмуціў вас у пасланьні, не шкадую, хоць і шкадаваў быў, бо бачу, што пасланьне
тое, хоць і на гадзіну, засмуціла вас.
9 Цяпер я радуюся не дзеля таго, што вы засмуціліся, але што вы засмуціліся на навяртаньне,
бо засмуціліся паводле Бога, каб ні ў чым ня мелі ад нас шкоды.
10 Бо смутак паводле Бога робіць нязьменнае навяртаньне на збаўленьне, а смутак гэтага
сьвету робіць сьмерць.
11 Бо, вось, самае тое, што вы засмуціліся паводле Бога, якую вялікую дбайнасьць учыніла ў
вас, і абарону, і абурэньне, і страх, і жаданьне, і руплівасьць, і адплату! У-ва ўсім вы паказалі
сябе чыстымі ў гэтай справе.
12 Таму, калі я і пісаў да вас, дык не дзеля таго, хто пакрыўдзіў, і не дзеля таго, хто
пакрыўджаны, але каб выявілася вам дбайнасьць нашая пра вас перад Богам.
13 Дзеля гэтага мы суцешыліся пацяшэньнем вашым; а яшчэ больш узрадаваліся мы радасьцю
Ціта, што быў супакоены дух ягоны вамі ўсімі.
14 Дык я не асароміўся, калі чым пахваліўся вамі перад ім; але, як мы вам гаварылі ўсё ў
праўдзе, гэтак і перад Цітам пахвала нашая сталася праўдаю.
15 І сэрца ягонае яшчэ больш [зьвернута] да вас, калі ён узгадвае паслухмянасьць усіх вас, як
вы прынялі яго са страхам і дрыжаньнем.
16 І я радуюся, што ў-ва ўсім маю пэўнасьць у вас.

2 Кар 8

1 Паведамляем вам, браты, пра ласку Божую, якая дадзеная цэрквам Македоніі,
2 бо ў вялікім выпрабаваньні прыгнётам у іх багата радасьці, і ў глыбокай убогасьці іхняй
памнажаецца багацьце іхняй шчырасьці,
3 бо яны маюць добрую ахвоту па сілах і звыш сілы, я сьведчу гэта.
4 Са шматлікімі просьбамі яны прасілі нас прыняць ласку і супольнасьць служэньня для
сьвятых;
5 ды ня толькі, як мы спадзяваліся, але яны аддалі сябе спачатку Госпаду, і нам паводле волі
Божай.
6 Дзеля гэтага мы прасілі Ціта, каб ён, як пачаў, так і зьдзейсьніў у вас і гэтую ласку.
7 А як вы багатыя ўсім: вераю, і словам, і веданьнем, і ўсякай дбайнасьцю, і любоўю вашаю да
нас, дык і ў гэтай ласцы мейце шчодра.
8 Кажу гэта не як загад, але дбайнасьцю іншых выпрабоўваю шчырасьць і вашай любові.
9 Бо вы ведаеце ласку Госпада нашага Ісуса Хрыста, што Ён, быўшы багатым, зьбяднеў дзеля
вас, каб вы Яго ўбоствам узбагаціліся.
10 І я даю ў гэтым параду, бо гэта карысна вам, якія ня толькі рабіць, але і хацець пачалі з
леташняга году.
11 А цяпер зьдзейсьніце справу, каб, як з ахвотаю хацелі, гэтак і зьдзейсьнілі паводле
магчымасьці.
12 Бо, калі была раней ахвота, яна адпаведная паводле таго, як хто мае, а не паводле таго, як
ня мае.
13 Бо не на тое, каб другім была палёгка, а вам прыгнёт, але каб была роўнасьць.
14 У цяперашні час ваш лішак дзеля іх нястачы, каб і іхні лішак стаўся дзеля вашае нястачы,
каб была роўнасьць,
15 як напісана: «Хто [сабраў] шмат, ня меў лішку; і хто мала, ня меў нястачы».
16 Дзякуй Богу, Які даў у сэрцы Ціта гэткую дбайнасьць адносна вас,
17 бо ён і просьбу прыняў, і з вялікай дбайнасьцю сваёй ахвотай пайшоў да вас.
18 А з ім паслалі мы брата, якога хваляць за Эвангельле ў-ва ўсіх цэрквах.
19 І ня толькі гэта, але ён і рукапакладзены ад цэркваў спадарожнік наш з тою ласкаю, якою
мы служым на славу Самога Госпада і паводле вашае ахвоты,

20 высьцерагаючыся, каб ня ганіў нас хто за гэткае мноства [служэньняў], якімі мы служым,
21 бо мы дбаем пра добрае ня толькі перад Госпадам, але і перад людзьмі.
22 Дык мы паслалі з імі брата нашага, якога дбайнасьць мы часта выпрабоўвалі шмат у чым, які цяпер яшчэ больш дбайны дзеля вялікай пэўнасьці адносна вас.
23 Што да Ціта, гэта мой супольнік і ваш супрацоўнік; а што да братоў нашых, яны — пасланцы цэркваў, слава Хрыста.
24 Дык перад абліччам цэркваў зьявіце ім доказ любові вашай і пахвалы нашае адносна вас.

2 Кар 9

1 Бо для мяне лішне пісаць да вас адносна служэньня для сьвятых,
2 бо я ведаю вашую ахвоту, якой хвалюся вамі перад Македонцамі, што Ахая прыгатаваная з мінулага году; і руплівасьць вашая заахвоціла многіх.
3 Братоў жа я паслаў, каб нашая пахвала адносна вас не прынізілася ў гэтым, але каб вы, як я казаў, былі прыгатаваныя,
4 каб, калі прыйдуць са мною Македонцы і знойдуць вас непрыгатаванымі, мы не асароміліся, каб не сказаць “вы”, пахваліўшыся з гэткаю пэўнасьцю.
5 Дык я палічыў патрэбным папрасіць братоў, каб яны наперад пайшлі да вас і загадзя паклапаціліся, каб абяцанае раней дабраславеньне вашае было падрыхтаванае так, як дабраславеньне, а не як з прымусу.
6 Вось жа: хто сее скупа, той скупа і пажне; а хто сее з дабраславеньнем, той з дабраславеньнем і пажне.
7 Кожны [няхай робіць] паводле вызначэньня сэрца, не са смуткам або з патрэбы, бо Бог любіць таго, хто з добрай ахвотай дае.
8 А Бог магутны памножыць у вас усякую ласку, каб, заўсёды і ў-ва ўсім маючы ўсялякую задаволенасьць, вы былі багатыя на ўсякую добрую справу,
9 як напісана: «Раскідаў, раздаў бедным; праведнасьць ягоная застаецца на вякі».
10 А Той, Хто дае насеньне сейбіту, дасьць і хлеб дзеля ежы, і памножыць насеньне вашае, і вырасьціць плады праведнасьці вашае,
11 каб у-ва ўсім вы ўзбагаціліся ў-ва ўсякай шчырасьці, якая праз нас робіць падзяку Богу.
12 Бо справаваньне служэньня гэтага ня толькі дапаўняе нястачы сьвятых, але і багатае падзякамі да Бога ад многіх,
13 якія, выпрабаваўшы служэньне гэтае, славяць Бога за падпарадкаванасьць вызнаванаму вамі Эвангельлю Хрыстоваму і за шчырую супольнасьць з імі і з усімі
14 і моляцца за вас, жадаючы [быць] з вамі дзеля бязьмернай ласкі Божае ў вас.
15 Падзяка Богу за невымоўны дар Ягоны.

2 Кар 10

1 А я, Павал, які асабіста між вамі пакорны, а адсутны — адважны адносна вас, прашу вас праз ціхасьць і спагаднасьць Хрыста.
2 А прашу [пра тое], каб мне, калі прыйду, ня быць адважным з той пэўнасьцю, з якою я думаю адважыцца супраць некаторых, што думаюць пра нас, быццам мы паводле цела ходзім.
3 Бо мы, ходзячы ў целе, не паводле цела змагаемся,
4 бо зброя змаганьня нашага не цялесная, але магутная ад Бога на руйнаваньне цьвярдыняў.
5 [Мы змагаемся,] руйнуючы думкі і ўсякае ўзьвялічваньне, якія ўздымаюцца супраць веданьня Бога, і беручы ў палон усякую думку на паслухмянасьць Хрысту,
6 і гатовыя пакараць кожную непаслухмянасьць, калі вашая паслухмянасьць споўніцца.
7 Ці на аблічча вы глядзіцё? Калі хто перакананы ў сабе, што ён — Хрыстовы, той няхай думае ў сабе, што, як ён — Хрыстовы, гэтак і мы — Хрыстовыя.
8 Бо калі я яшчэ больш буду хваліцца нашай уладай, якую Госпад даў нам на збудаваньне, а не на руйнаваньне вашае, не асаромлюся.
9 Каб ня думаў хто, быццам я палохаю вас пасланьнямі,

10 што скажа: «Пасланьні важкія і магутныя, а прыйшоўшы целам — слабы, і слова [вартае]
пагарды».
11 Гэтакі няхай улічыць, што, якія мы ў слове ў пасланьнях, адсутныя, гэткія і на справе,
прысутныя.
12 Бо мы не адважваемся мерацца ці параўноўвацца з некаторымі, якія самі сябе
адрэкамэндоўваюць, бо яны не разумеюць, што мераюць сябе самімі сабою і параўноўваюць
сябе з сабою.
13 А мы не бяз меры хваліцца будзем, але паводле меры меркі, якой надзяліў нас Бог мерыць,
каб дасягнуць і да вас.
14 Бо мы не напружваем сябе, быццам не дасягнуўшы да вас, бо мы дасягнулі вас Эвангельлем
Хрыстовым.
15 Мы не бяз меры хвалімся чужою працаю, але маем надзею, што з узрастаньнем веры вашае
з лішкам узьвялічымся і мы ў вас паводле часткі нашае,
16 каб дабравесьціць і далей па-за вамі, а не хваліцца прыгатаваным у чужой частцы.
17 А хто хваліцца, няхай у Госпадзе хваліцца.
18 Бо ня той варты, хто сам сябе адрэкамэндоўвае, але каго адрэкамэндоўвае Госпад.

2 Кар 11

1 О, каб вы крыху пацярпелі маю неразумнасьць! Але вы і церпіце мяне!
2 Бо я руплюся пра вас руплівасьцю Божай, бо я заручыў вас з адным Мужам, каб паставіць
побач з Хрыстом чыстую дзеву.
3 Але баюся, каб, як зьмей зьвёў Еву подступам сваім, гэтак і вашыя думкі не папсаваліся,
[адыйшоўшы] ад шчырасьці, якая ў Хрысьце.
4 Бо калі хто, прыйшоўшы, будзе абвяшчаць іншага Ісуса, якога мы не абвяшчалі, ці калі вы
атрымаеце іншага духа, якога ня атрымоўвалі, ці іншае Эвангельле, якога не прыймалі, дык
вы будзеце вельмі цярплівымі.
5 Але я лічу, што я ні ў чым ня горшы ад найпаважнейшых апосталаў,
6 бо, хоць я просты ў слове, але ня ў веданьні, бо мы ў-ва ўсім выявілі гэта сярод вас.
7 Ці ўчыніў я грэх, што паніжаў сябе, каб узвысіць вас, бо задарма дабравесьціў вам Эвангельле
Божае?
8 У другіх цэркваў я браў, атрымліваючы плату дзеля служэньня вам, і, прысутны ў вас і маючы
нястачу, нікога не абцяжарваў,
9 бо нястачу маю дапоўнілі браты, якія прыйшлі з Македоніі; і ў-ва ўсім я пільнаваўся і буду
пільнавацца, каб ня быць вам цяжарам.
10 Ёсьць праўда Хрыстовая ў-ва мне, што пахвала гэтая ня будзе забраная ў мяне ў краях Ахаі.
11 Дзеля чаго? Ці што не люблю вас? Бог ведае!
12 Але гэта раблю і буду рабіць, каб адсекчы нагоду тым, якія хочуць [мець] нагоду, каб у тым,
чым яны хваляцца, былі знойдзены такімі, як і мы.
13 Бо гэтакія фальшывыя апосталы, падступныя работнікі, якія робяць выгляд апосталаў
Хрыстовых.
14 І ня дзіва, бо і сам шатан робіць выгляд анёла сьвятла.
15 Дык не вялікая рэч, калі і служыцелі ягоныя робяць выгляд служыцеляў праведнасьці; канец
іхні будзе паводле ўчынкаў іхніх.
16 Ізноў кажу: няхай ніхто ня лічыць мяне неразумным, а калі не, дык прыйміце мяне хоць як
неразумнага, каб і мне крыху нечым пахваліцца.
17 Што кажу, тое кажу не паводле Госпада, але як у неразумнасьці, у гэткай пэўнасьці
пахвальбы.
18 Калі многія хваляцца паводле цела, і я буду хваліцца.
19 Бо вы [людзі] мудрыя, ахвотна церпіце неразумных.
20 Бо вы церпіце, калі хто вас зьневаляе, калі хто аб’ядае, калі хто абірае, калі хто вывышаецца,
калі хто б’е вас па абліччы.

21 На сорам кажу, што мы быццам саслабелі. А калі хто адважваецца ў чым, кажу ў
неразумнасьці, адважваюся і я.
22 Яны Гебраі? І я. Яны Ізраільцяне? І я. Яны — насеньне Абрагама? І я.
23 Яны — служыцелі Хрыста? Здурэўшы кажу: я больш! Шмат больш у працы, бязьмерна ў
ранах, шмат больш у вязьніцах, часта пры сьмерці.
24 Ад Юдэяў пяць разоў атрымаў сорак [удараў] без аднаго;
25 тройчы білі мяне кіямі, аднойчы каменавалі; тройчы разьбіваўся карабель, ноч і дзень быў
я ў глыбіні.
26 Часта ў падарожжах, у небясьпеках на рэках, у небясьпеках ад разбойнікаў, у небясьпеках
ад свайго народу, у небясьпеках ад паганаў, у небясьпеках у горадзе, у небясьпеках у пустыні,
у небясьпеках на моры, у небясьпеках між фальшывымі братамі,
27 у працы і ў стоме, часта ў чуваньнях, у голадзе і смазе, часта ў пастах, у сьцюжы і галізьне.
28 Акрамя выключных [здарэньняў], у мяне штодня зграмаджэньне, турбота пра ўсе цэрквы.
29 Хто зьнемагае, і я не зьнемагаю? Хто горшыцца, і я не палаю?
30 Калі мушу хваліцца, буду хваліцца маёй слабасьцю.
31 Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які дабраслаўлёны на вякі, ведае, што я не хлушу.
32 У Дамаску намесьнік валадара Арэты ахоўваў горад Дамаск, хочучы схапіць мяне;
33 і я ў кашы быў спушчаны з вакна праз мур, і ўцёк ад рук ягоных.

2 Кар 12

1 Не карысна мне хваліцца, бо я дайду да відзежаў і адкрыцьцяў Госпадавых.
2 Ведаю чалавека ў Хрысьце, які чатырнаццаць гадоў таму, ці ў целе — ня ведаю, ці па-за целам
— ня ведаю, Бог ведае, быў падхоплены да трэцяга неба.
3 І ведаю гэткага чалавека, ці ў целе, ці па-за целам, ня ведаю, Бог ведае,
4 які быў падхоплены ў рай і чуў невымоўныя словы, якіх чалавеку нельга вымавіць.
5 Гэтакім буду хваліцца, а сабою ня буду хваліцца, хіба толькі слабасьцямі маімі.
6 Бо калі захачу хваліцца, ня буду неразумным, бо скажу праўду; але я шкадую сябе, каб ніхто
не падумаў пра мяне больш, чым бачыць у-ва мне або чуе ад мяне.
7 І, каб я не вывышаўся празьмернасьцю адкрыцьцяў, дадзены мне бадыль у цела, анёл шатана,
каб біць мяне, каб я не вывышаўся.
8 Дзеля гэтага тройчы прасіў я Госпада, каб ён адыйшоў ад мяне.
9 І [Госпад] сказаў мне: «Хопіць табе ласкі Маёй, бо моц Мая спаўняецца ў слабасьці». Дык
ахвотна больш буду хваліцца слабасьцямі маімі, каб жыла ў-ва мне моц Хрыстовая.
10 Дзеля гэтага я маю ўпадабаньне і ў слабасьцях, у крыўдах, у патрэбах, у перасьледаваньнях,
ва ўцісках за Хрыста, бо, калі я слабы, тады моцны.
11 Я стаўся неразумным, хвалячыся; вы мяне змусілі. Бо трэба было, каб я вамі быў
адрэкамэндаваны, бо ні ў чым я ня горшы за найпаважнейшых апосталаў, хоць я і нішто.
12 Знакі апостала ўчыненыя між вамі ў-ва ўсякай цярплівасьці, у знаках, і цудах, і сілах.
13 Бо што ёсьць, у чым вы горшыя за іншыя цэрквы? Хіба тое, што я ня быў вам цяжарам.
Даруйце мне гэткую несправядлівасьць.
14 Вось, трэці раз я гатовы ісьці да вас і ня буду цяжарам для вас, бо шукаю ня вашага, але вас.
Бо ня дзеці павінны зьбіраць скарбы для бацькоў, але бацькі для дзяцей.
15 Я ахвотна буду выдаткоўваць [сваё] і аддаваць сябе за душы вашыя, нават калі, любячы вас
шмат больш, я менш люблены вамі.
16 Дык няхай я сам не абцяжарваў вас, але можа, як хітрун, подступам браў з вас?
17 Нікога я не пасылаў да вас, каб праз яго скарыстацца ад вас
18 Я прасіў Ціта і паслаў з [ім] брата. Ці скарыстаўся чым ад вас Ціт? Ці ня ў тым самым Духу
мы хадзілі? Ці не па тых самых сьлядах?
19 Ці ізноў думаеце, што мы апраўдываемся перад вамі? Мы гаворым перад Богам у Хрысьце,
а ўсё, улюбёныя, дзеля вашага збудаваньня.

20 Бо баюся, каб, прыйшоўшы, не знайсьці мне вас такімі, якімі не хачу, і каб вам не
знайсьці мяне такім, якім ня хочаце; каб не было сварак, зайздрасьці, ярасьці, сварлівасьці,
абмаўляньняў, нагавораў, пыхі, бязладзьдзя,
21 каб, калі ізноў прыйду, не панізіў мяне Бог мой у вас, і каб я ня плакаў пра многіх, якія
зграшылі раней і не навярнуліся ад нячыстасьці, і распусты, і бессаромнасьці, якія ўчынялі.

2 Кар 13

1 Ужо ў трэці раз я іду да вас. Пры вуснах двух сьведкаў або трох будзе стаяць кожнае слова.
2 Я раней казаў і папярэджваю, як прысутны ў вас другі раз, і цяпер, адсутны, пішу да тых, якія
раней зграшылі, і ўсіх іншых, што, калі зноў прыйду, ня буду шкадаваць.
3 Вы шукаеце доказу, што ў-ва мне гаворыць Хрыстос, Які не слабы для вас, але моцны ў вас.
4 Бо хоць Ён і ўкрыжаваны ў нядужасьці, але жывы сілаю Божай; і мы слабыя ў Ім, але будзем
жывыя з Ім сілаю Божаю ў вас.
5 Выпрабуйце саміх сябе, ці вы ў веры? Саміх сябе выспрабуйце. Ці вы ня ведаеце саміх сябе,
што Ісус Хрыстос у вас? Хіба што вы ў нечым няздатныя.
6 А спадзяюся, што вы даведаецеся, што мы не няздатныя.
7 Мы ж молімся да Бога, каб вы не рабілі аніякага ліха, не каб нам выглядаць вартымі, але каб
вы рабілі дабро, а мы былі як няздатныя.
8 Бо мы нічога ня можам супраць праўды, а толькі за праўду.
9 Бо мы радуемся, калі мы слабыя, а вы моцныя; і пра гэта і молімся, пра вашую дасканаласьць.
10 Дзеля гэтага я і пішу гэтае, адсутны, каб, прысутны, ня дзейнічаў сувора паводле ўлады,
якую даў мне Госпад на збудаваньне, а не на руйнаваньне.
11 Нарэшце, браты, радуйцеся, рабіцеся дасканалымі, суцяшайцеся, будзьце аднадумнымі,
жывіце ў супакоі, і Бог любові і супакою будзе з вамі.
12 Прывітайце адзін аднаго ў сьвятым пацалунку. Вітаюць вас усе сьвятыя.
13 Ласка Госпада Ісуса Хрыста, і любоў Божая, і супольнасьць Сьвятога Духа з усімі вамі. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ГАЛЯТАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, апостал не ад людзей і не праз чалавека, але праз Ісуса Хрыста і Бога Айца, Які
ўваскрасіў Яго з мёртвых,
2 і ўсе браты, што са мною, — цэрквам Галятыі:
3 ласка вам і супакой ад Бога Айца і ад Госпада нашага Ісуса Хрыста,
4 Які аддаў Сябе за грахі нашыя, каб вырваць нас з цяперашняга веку злога паводле волі Бога і
Айца нашага,
5 Якому слава на вякі вякоў. Амэн.
6 Дзіўлюся, што вы гэтак хутка перакінуліся ад Таго, Які паклікаў вас да ласкі Хрыста, да іншага
дабравесьця,
7 якое ня ёсьць іншае, а толькі ёсьць некаторыя, якія вас трывожаць і хочуць перамяніць
Эвангельле Хрыстовае.
8 Але калі нават мы ці анёл з неба будзе дабравесьціць вам насуперак таму, што мы
дабравесьцілі вам, няхай будзе адлучаны!
9 Як раней мы сказалі, і цяпер ізноў кажу: калі хто дабравесьціць вам насуперак таму, што вы
прынялі, няхай будзе адлучаны!
10 Бо ці ж я на людзей спадзяюся, ці на Бога? Ці шукаю, каб спадабацца людзям? Бо калі б я
яшчэ людзям дагаджаў, дык ня быў бы слугою Хрыста.
11 Паведамляю ж вам, браты, што Эвангельле, якое я дабравесьціў, ня ёсьць ад чалавека;
12 бо я не праз чалавека прыняў яго і быў навучаны, але праз адкрыцьцё Ісуса Хрыста.
13 Бо вы чулі пра мой ранейшы лад жыцьця ў Юдэйстве, што я бяз меры перасьледаваў Царкву
Божую і нішчыў яе,
14 і апярэджваў у Юдэйстве многіх аднагодкаў у родзе маім, будучы найбольшым рупліўцам
традыцыяў бацькоў маіх.
15 Калі ж спадабалася Богу, Які аддзяліў мяне ад улоньня маці маёй і паклікаў ласкай Сваёй,
16 адкрыць у-ва мне Сына Свайго, каб я дабравесьціў Яго сярод паганаў, я адразу не зьвярнуўся
да цела і крыві
17 і не ўзыйшоў у Ерусалім да апосталаў, якія былі раней за мяне, але пайшоў у Арабію і зноў
вярнуўся ў Дамаск.
18 Пасьля, праз тры гады, я ўзыйшоў у Ерусалім пабачыцца з Пятром і быў у яго пятнаццаць
дзён.
19 А з іншых апосталаў я ня бачыў нікога, акрамя Якуба, брата Госпадавага.
20 А што пішу вам, вось, перад Богам [сьведчу], што не хлушу.
21 Пасьля я пайшоў у краіны Сірыі і Кілікіі.
22 А з аблічча я быў невядомы цэрквам Юдэі, што ў Хрысьце,
23 а толькі чулі яны, што той, які некалі перасьледаваў іх, цяпер дабравесьціць веру, якую
раней нішчыў,
24 і славілі за мяне Бога.

Гал 2

1 Пасьля, праз чатырнаццаць гадоў, хадзіў я ізноў у Ерусалім з Барнабам, узяўшы з сабою і Ціта.
2 Хадзіў жа я паводле адкрыцьця і прадставіў ім, асабліва тым, якія лічацца [галоўнымі],
Эвангельле, якое абвяшчаю сярод паганаў, ці не надарма бягу або бег?
3 Але і Ціт, які быў са мною, які быў Грэк, ня быў змушаны абрэзацца.
4 Фальшывым жа братам, якія паўкрадаліся і прыйшлі падгледзець нашую свабоду, якую мы
маем у Хрысьце Ісусе, каб зьняволіць нас,
5 мы ні на гадзіну не паддаліся і не падпарадкаваліся, каб праўда Эвангельля захавалася ў вас.

6 А тыя, якія лічацца [галоўнымі], (хоць якія яны былі некалі, для мяне няма розьніцы, [бо]
Бог не зважае на аблічча чалавека), тыя, якія лічацца [галоўнымі], мне нічога не пярэчылі,
7 але наадварот, убачыўшы, што мне даверана Эвангельле [для] неабрэзаных, як Пятру — [для]
абрэзаных,
8 бо Той, Які дзейнічаў праз Пятра ў апостальстве ў абрэзаных, дзейнічаў і праз мяне між
паганамі,
9 і пазнаўшы ласку, якая дадзена мне, Якуб, і Кіфа, і Ян, якія лічацца слупамі, далі мне і Барнабу
правіцу супольнасьці, каб мы [ішлі] да паганаў, а яны — да абрэзаных,
10 толькі каб мы памяталі пра ўбогіх, што я гэтаксама і намагаўся рабіць.
11 Калі ж Пётар прыйшоў у Антыёхію, я асабіста супрацьстаў яму, таму што [варта] было
дакараць [яго].
12 Бо перад тым, як прыйшлі некаторыя ад Якуба, ён еў разам з паганамі; а калі яны прыйшлі,
ухіляўся і аддзяляўся, баючыся абрэзаных.
13 І з ім крывадушнічалі іншыя Юдэі, так што нават Барнаба быў захоплены іхняй
крывадушнасьцю.
14 Але калі я ўбачыў, што яны ня ходзяць проста паводле праўды Эвангельскай, я сказаў
Пятру пры ўсіх: «Калі ты, будучы Юдэем, жывеш па-паганску, а не па-юдэйску, чаму паганаў
змушаеш жыць па-юдэйску?»
15 Мы паводле прыроды Юдэі, а не з паганаў грэшнікі,
16 ведаючы, што чалавек апраўдваецца не праз учынкі Закону, а толькі праз веру ў Ісуса
Хрыста, і мы паверылі ў Хрыста Ісуса, каб апраўдацца праз веру ў Хрыста, а не праз учынкі
Закону, бо праз учынкі Закону ня будзе апраўданае ніводнае цела.
17 А калі, шукаючы апраўданьня ў Хрысьце, мы самі аказаліся грэшнікамі, дык ці Хрыстос —
служыцель грэху? Няхай ня станецца!
18 Бо калі я зноў будую тое, што зруйнаваў, сам сябе зьяўляю парушальнікам.
19 Бо праз Закон я памёр для Закону, каб жыць для Бога.
20 Я ўкрыжаваны з Хрыстом, і ўжо ня я жыву, але жыве ў-ва мне Хрыстос. А што цяпер жыву ў
целе, жыву праз веру ў Сына Божага, Які палюбіў мяне і выдаў Сябе за мяне.
21 Не адкідаю ласкі Божае. Бо калі праз Закон праведнасьць, дык Хрыстос надарма памёр.

Гал 3

1 О, бяздумныя Галяты! Хто зачараваў не пакарацца праўдзе вас, перад вачыма якіх быў раней
апісаны Ісус Хрыстос, [нібыта] ў вас укрыжаваны?
2 Гэтае толькі хачу даведацца ад вас: ці праз учынкі Закону вы атрымалі Духа, ці праз
слуханьне веры?
3 Ці вы гэткія бяздумныя, што, пачаўшы духам, цяпер сканчваеце целам?
4 Ці гэтулькі перацярпелі вы надарма? Дый каб жа надарма!
5 Дык ці Той, Які дае вам Духа і робіць між вамі цуды, праз учынкі Закону [робіць] ці праз
слуханьне веры?
6 Як Абрагам паверыў Богу, і залічана яму за праведнасьць,
7 гэтак і вы разумейце, што тыя, хто з веры, гэтыя ёсьць сыны Абрагама.
8 А Пісаньне, прадбачачы, што з веры Бог апраўдвае паганаў, раней дабравесьціла Абрагаму:
«У табе будуць дабраслаўлёныя ўсе народы».
9 Так што тыя, хто з веры, дабраслаўляюцца разам з верным Абрагамам.
10 Бо ўсе тыя, хто праз учынкі Закону, тыя пад праклёнам. Бо напісана: «Пракляты ўсякі, хто
не трывае ў-ва ўсім, што напісана ў кнізе Закону, каб рабіць гэтае».
11 А што Законам ніхто не апраўдаецца перад Богам, зразумела, бо: «Праведны з веры жыць
будзе».
12 А Закон ня ёсьць з веры, але: «Чалавек, які спаўняе яго, жыць будзе ім».
13 Хрыстос адкупіў нас ад праклёну Закону, стаўшыся за нас праклёнам, бо напісана:
«Пракляты ўсякі, хто вісіць на дрэве»,

14 каб дабраслаўленьне Абрагама ў Хрысьце Ісусе сталася на паганаў, каб абяцаньне Духа мы
атрымалі праз веру.
15 Браты, па-чалавечаму кажу: нават чалавекам засьведчанага запавету ніхто не адкідае, ані
не дадае [да яго].
16 Абяцаньні ж былі сказаныя Абрагаму і насеньню ягонаму. Ня кажа: «і насеньням», як пра
многіх, але як пра аднаго: «і насеньню твайму», якое ёсьць Хрыстос.
17 Я вось кажу тое, што запавет пра Хрыста, раней засьведчаны Богам, Закон, які стаўся праз
чатырыста трыццаць гадоў, не пазбаўляе сілы, каб зьнішчыць абяцаньне.
18 Бо калі спадчына праз Закон, дык ужо не праз абяцаньне; а Абрагаму Бог падараваў [яе]
праз абяцаньне.
19 Дык навошта Закон? Ён дадзены з прычыны парушэньняў, пакуль прыйдзе насеньне, пра
якое дадзена абяцаньне, загаданае праз анёлаў рукою пасярэдніка.
20 Пасярэднік жа ня ёсьць пры адным, а Бог адзін.
21 Дык ці Закон супраць абяцаньняў Божых? Няхай ня станецца! Бо калі б быў дадзены закон,
які можа ажыўляць, праўдзіва, праведнасьць была б з закону.
22 Але Пісаньне замкнула ўсё пад грэхам, каб абяцаньне з веры Ісуса Хрыста было дадзена тым,
якія вераць.
23 А перш, чым прыйшла вера, мы былі пад аховаю Закону, замкнёныя дзеля [атрыманьня]
веры, якая мела адкрыцца.
24 Так што Закон стаўся нашым выхавацелем да Хрыста, каб нам быць апраўданымі з веры.
25 А калі прыйшла вера, мы ўжо не пад выхавацелем,
26 бо ўсе вы — сыны Божыя праз веру ў Хрыста Ісуса.
27 Бо ўсе тыя, хто ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся.
28 Няма ані Юдэя, ані Грэка; няма ані слугі, ані свабоднага; няма ані мужчыны, ані жанчыны,
бо ўсе вы адно ў Хрысьце Ісусе.
29 А калі вы — Хрыстовыя, дык вы — насеньне Абрагама і паводле абяцаньня — спадкаемцы.

Гал 4

1 Кажу вось: увесь час, пакуль спадкаемца — немаўля, ён нічым ня лепшы за слугу, хоць ён
пан усяго,
2 але ён пад наглядчыкамі і аканомамі аж да вызначанага бацькам часу.
3 Гэтак і мы, калі былі немаўлятамі, былі паняволеныя стыхіям сьвету.
4 А калі прыйшла поўня часу, Бог паслаў Сына Свайго, Які быў з жанчыны і быў пад Законам,
5 каб адкупіць тых, якія пад Законам, каб нам атрымаць усынаўленьне.
6 А як вы — сыны, Бог паслаў у сэрцы вашыя Духа Сына Свайго, Які кліча: «Абба, Ойча!»
7 Так што ты ўжо не слуга, але сын; а калі сын, дык і спадкаемца Бога праз Хрыста.
8 Але тады, ня ведаючы Бога, вы служылі тым, якія паводле прыроды ня ёсьць богі.
9 Цяпер жа, пазнаўшы Бога, а больш пазнаныя Богам, як вы вяртаецеся ізноў да нядужых і
ўбогіх стыхіяў, якім зноў хочаце служыць нанова?
10 Вы сочыце за днямі, і месяцамі, і порамі, і гадамі.
11 Баюся за вас, ці не надарма я працаваў у вас.
12 Прашу вас, браты, будзьце, як і я, бо і я, як вы. Вы нічым ня скрыўдзілі мяне.
13 А вы ведаеце, што я ў нядужасьці цела дабравесьціў вам раней,
14 і вы не пагардзілі спакусай маёй, якая ў целе маім, і не адапхнулі, але прынялі мяне, як
анёла Божага, як Хрыста Ісуса.
15 Дык якое было шчасьце вашае! Бо сьведчу вам, што калі б было магчыма, вырваўшы вочы
вашыя, вы далі б мне.
16 Дык ці ж я стаўся ворагам вашым, кажучы вам праўду?
17 Рупяцца пра вас нядобра, але хочуць аддзяліць вас [ад нас], каб вы рупіліся пра іх.
18 А добра рупіцца пра добрае заўсёды, а ня толькі, калі я прысутны ў вас,
19 дзеткі мае, якімі ізноў мучуся ў радзінах, пакуль не ўкшталтуецца ў вас Хрыстос.

20 Хацеў бы я цяпер быць прысутным у вас і зьмяніць голас мой, бо я зьбянтэжаны вамі.
21 Скажыце мне вы, якія хочаце быць пад Законам: ці ж вы ня слухаеце Закону?
22 Бо напісана, што Абрагам меў двух сыноў: аднаго ад служкі і аднаго ад свабоднай.
23 Але той, які ад служкі, народжаны паводле цела, а той, які ад свабоднай, — праз абяцаньне.
24 Гэта ёсьць алегорыя. Бо гэта два запаветы: адзін — ад гары Сынай, які нараджае на няволю, які ёсьць Агар.
25 Бо Агар ёсьць гара Сынай у Арабіі і адпавядае цяперашняму Ерусаліму, які ў няволі з дзецьмі сваімі;
26 а Ерусалім, які ўгары, — свабодны, ён ёсьць маці ўсім нам.
27 Бо напісана: «Узьвесяліся, няплодная, якая не нараджала; загукай і закрычы ты, якая, якая ня мучылася ў радзінах, бо шмат дзяцей у самотнай, больш, чым у той, якая мае мужа».
28 А мы, браты, паводле Ісаака — дзеці абяцаньня.
29 Але як тады той, які быў народжаны паводле цела, перасьледаваў таго, які паводле духа, гэтак і цяпер.
30 Але што кажа Пісаньне? «Выгані служку і сына ейнага, бо сын служкі ня будзе спадкаемцам разам з сынам свабоднай».
31 Дык вось, браты, мы — дзеці ня служкі, але свабоднай.

Гал 5

1 Дык стойце ў свабодзе, якою вызваліў нас Хрыстос, і не патрапляйце ізноў пад ярмо няволі.
2 Вось я, Павал, кажу вам, што, калі вы абрэзваецеся, Хрыстос вам ня дасьць ніякай карысьці.
3 Зноў жа сьведчу ўсякаму чалавеку, які абрэзваецца, што ён павінен выканаць увесь Закон.
4 Вы, якія апраўдваецеся праз Закон, зьнішчылі [ў сабе] Хрыста, адпалі ад ласкі.
5 Бо мы духам праз веру чакаем надзеі праведнасьці.
6 Бо ў Хрысьце Ісусе ня мае сілы ані абразаньне, ані неабразаньне, але вера, якая дзейнічае праз любоў.
7 Вы беглі добра. Хто перашкодзіў вам, каб вы ня мелі перакананасьці ў праўдзе?
8 Гэткае перакананьне не ад Таго, Які вас кліча.
9 Малая кісьля ўсё цеста квасіць.
10 Я перакананы наконт вас у Госпадзе, што вы ня будзеце думаць аніяк іначай. А той, хто вас трывожыць, хто б ён ні быў, атрымае асуджэньне.
11 Калі ж я, браты, усё яшчэ абвяшчаю абразаньне, чаму я перасьледаваны? Тады зьнішчанае будзе згаршэньне крыжа.
12 О, каб былі адсечаны тыя, якія вас бунтуюць!
13 Бо вы да свабоды пакліканыя, браты. Толькі каб свабода ня [сталася] нагодай для [пажаданьняў] цела, але праз любоў служыце адзін аднаму.
14 Бо ўвесь Закон у адным слове спаўняецца: «Любі бліжняга твайго як самога сябе».
15 Калі ж адзін аднаго кусаеце і зьядаеце, глядзіце, ня будзьце зьнішчаныя адзін адным.
16 А я кажу: хадзіце [паводле] духа і пажаданьняў цела ня будзеце спаўняць.
17 Бо цела жадае насупраць духу, а дух — насупраць целу: яны адзін аднаму працівяцца, каб вы рабілі ня тое, што б хацелі.
18 Калі ж вы ведзеныя духам, вы не пад Законам.
19 А ўчынкі цела яўныя, яны ёсьць чужалоства, распуста, нячыстасьць, бессаромнасьць,
20 ідалапаклонства, чараўніцтва, варожасьць, сваркі, рэўнасьць, ярасьць, сварлівасьць, нязгода, герэзіі,
21 зайздрасьць, забойствы, п’янства, гулянкі і падобнае гэтаму. Гэта наперад кажу вам, як і раней казаў, што тыя, якія гэтак робяць, не ўспадкаемяць Валадарства Божага.
22 Плод жа Духа — любоў, радасьць, супакой, доўгацярплівасьць, ласкавасьць, добрасьць, вера,
23 ціхасьць, стрыманасьць. Супраць гэтакіх няма Закону.
24 А тыя, якія Хрыстовыя, укрыжавалі цела з пакутамі і пажаданьнямі.
25 Калі мы жывем [паводле] Духа, дык і ходзім сьледам за Духам.

26 Не шукайма пустой славы, адзін аднаго раздражняючы, адзін аднаму зайздросьцячы.

Гал 6

1 Браты, калі і ўпадзе чалавек у які праступак, вы, духоўныя, выпраўляйце гэткага ў духу
ціхасьці, зважаючы на сябе, каб ня быць спакушанымі.
2 Насіце цяжары адзін аднаго, і гэтак споўніце закон Хрыстовы.
3 Бо калі хто думае, што ён ёсьць нешта, будучы нічым, ашуквае самога сябе.
4 А кожны няхай выспрабоўвае справы свае, і тады будзе мець пахвалу толькі адносна сябе, а
не адносна другога.
5 Бо кожны панясе свой цяжар.
6 А хто навучаецца ў слове, няхай дзеліцца ўсякім дабром з тым, хто навучае.
7 Не падманвайцеся, з Бога не пасьмяешся. Бо што чалавек сее, тое і будзе жаць.
8 Хто сее ў цела сваё, з цела будзе жаць сапсутасьць; а хто сее ў Дух, з Духа будзе жаць жыцьцё
вечнае.
9 А робячы дабро, ня будзем журыцца, бо ў свой час будзем жаць, калі не саслабеем.
10 Дык пакуль маем час, будзем рабіць дабро ўсім, а найбольш — сваім у веры.
11 Бачыце, якімі вялікімі літарамі напісаў я вам сваёю рукою.
12 Тыя, якія хочуць мець добры выгляд паводле цела, прымушаюць вас абрэзвацца толькі дзеля
таго, каб ня быць ім перасьледаванымі за крыж Хрыстовы.
13 Бо нават тыя, што абрэзваюцца, самі не захоўваюць Закон, але хочуць, каб вы абрэзваліся,
каб хваліцца целам вашым.
14 А мне няхай не надарыцца хваліцца, хіба толькі крыжам Госпада нашага Ісуса Хрыста, праз
які для мяне сьвет укрыжаваны, і я — для сьвету.
15 Бо ў Хрысьце Ісусе ня мае аніякай сілы ані абразаньне, ані неабразаньне, але новае
стварэньне.
16 І хто ходзіць паводле гэтага правіла, на тых — супакой і міласэрнасьць, і на Ізраіль Божы.
17 Нарэшце, няхай ніхто не дадае мне працы, бо я нашу пазнакі Госпада Ісуса на целе маім.
18 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з духам вашым, браты. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ЭФЭСЦАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, апостал Ісуса Хрыста з волі Божай, — сьвятым, што ў Эфэсе, і верным у Хрысьце Ісусе:
2 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
3 Дабраслаўлёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які дабраславіў нас у Хрысьце
ўсякім духоўным дабраслаўленьнем у нябёсах,
4 бо Ён выбраў нас у Ім да стварэньня сьвету, каб быць нам сьвятымі і беззаганнымі перад Ім
у любові,
5 прадвызначыўшы нас на ўсынаўленьне Сабе праз Ісуса Хрыста з упадабаньня волі Сваёй,
6 на пахвалу славы ласкі Сваёй, якой абдарыў нас ва Улюбёным,
7 у Якім маем адкупленьне праз кроў Яго, адпушчэньне грахоў, паводле багацьця ласкі Яго,
8 якую Ён шчодра зьявіў нам у-ва ўсякай мудрасьці і разуменьні,
9 даўшы нам ведаць таямніцу волі Сваёй, паводле ўпадабаньня Свайго, што Ён раней
пастанавіў у Сабе,
10 дзеля ўпарадкаваньня поўні часоў, каб усё, што ў небе і што на зямлі, было пад галавою —
Хрыстом.
11 У Ім, у Якім і мы сталіся спадкаемцамі, былі мы прадвызначаныя на гэта паводле
вызначэньня Таго, Хто ўсё зьдзяйсьняе паводле жаданьня волі Сваёй,
12 каб быць нам на пахвалу славы Яго, нам, якія раней спадзяваліся на Хрыста.
13 У Ім і вы, пачуўшы слова праўды, Эвангельле вашага збаўленьня, і паверыўшы ў Яго,
запячатаныя абяцаным Духам Сьвятым,
14 Які ёсьць зарука спадчыны нашае на выкупленьне ўдзелу, на пахвалу славы Яго.
15 Дзеля гэтага і я, пачуўшы пра вашую веру ў Хрыста Ісуса і пра любоў да ўсіх сьвятых,
16 няспынна дзякую за вас Богу, узгадваючы пра вас у малітвах маіх,
17 каб Бог Госпада нашага Ісуса Хрыста, Айцец славы, даў вам Духа мудрасьці і адкрыцьця ў
пазнаньні Яго,
18 прасьветленыя вочы сэрца вашага, каб вы ўбачылі, якая ёсьць надзея пакліканьня Яго, і якое
багацьце славы спадчыны Яго для сьвятых,
19 і якая бязьмерная вялікасьць моцы Яго для нас, якія вераць праз дзеяньне ўладнай
магутнасьці Яго,
20 якою Ён дзейнічаў у Хрысьце, уваскрасіўшы Яго з мёртвых і пасадзіўшы праваруч Сябе ў
небе,
21 вышэй за ўсякае начальства, і ўладу, і сілу, і панаваньне, і ўсякае імя, названае ня толькі ў
гэтым веку, але і ў будучым,
22 і ўсё Ён скарыў пад ногі Ягоныя і даў Яго за галаву над усім у Царкве,
23 якая ёсьць Цела Ягонае, поўня Таго, Які ўсё ў-ва ўсім напаўняе.

Эф 2

1 І вас, мёртвых праз праступкі і грахі вашыя,
2 у якіх вы некалі хадзілі паводле веку гэтага сьвету, па волі князя, які валадарыць у паветры,
духа, які дзейнічае цяпер у сынах непакорнасьці, —
3 між якімі і мы ўсе жылі некалі ў пажаданьнях цела нашага, выконваючы волю цела і думак,
і былі па прыродзе дзецьмі гневу, як і іншыя, —
4 Бог, багаты міласэрнасьцю, праз вялікую любоў Сваю, якою палюбіў нас,
5 і нас, мёртвых праз праступкі, ажывіў разам з Хрыстом, — ласкай [Божай] вы збаўленыя, —
6 і ўваскрасіў, і пасадзіў у нябёсах у Хрысьце Ісусе,
7 каб зьявіць у вяках, якія прыходзяць, бязьмернасьць багацьця ласкі Сваёй у ласкавасьці да
нас у Хрысьце Ісусе.
8 Бо ласкаю [Божай] вы збаўленыя праз веру; і гэта не ад вас — Божы дар:

9 не праз учынкі, каб ніхто не хваліўся.
10 Бо мы — твор Ягоны, створаныя ў Хрысьце Ісусе на добрыя ўчынкі, якія Бог загадзя прыгатаваў, каб мы ў іх хадзілі.
11 Дзеля гэтага памятайце, што вы, некалі пагане целам, называныя неабрэзанымі праз тых, якія завуцца абрэзанымі целам [абразаньнем], зробленым рукамі,
12 што вы былі ў той час без Хрыста, адлучаныя ад грамадзянства Ізраіля і чужыя запаветам абяцаньня, ня маючы надзеі і бязбожнікі ў сьвеце.
13 А цяпер у Хрысьце Ісусе вы, што былі некалі далёка, сталіся блізкімі праз кроў Хрыста.
14 Бо Ён — супакой наш, Які ўчыніў з абодвух адно і зруйнаваў загарадку, што стаяла пасярэдзіне,
15 зьнішчыўшы варожасьць Целам Сваім, Закон прыказаньняў, які быў у пастановах, каб з двух стварыць у Сабе аднаго новага чалавека, прыносячы супакой,
16 і ў адным целе пагадзіць абодвух з Богам праз крыж, забіўшы на ім варожасьць.
17 І, прыйшоўшы, Ён дабравесьціў супакой вам, якія далёка і якія блізка,
18 бо праз Яго абодва маем доступ да Айца ў адным Духу.
19 Дык вы ўжо не чужынцы і ня прыхадні, але суграмадзяне сьвятым і хатнія ў Бога,
20 збудаваныя на падмурку апосталаў і прарокаў, маючы Самога Ісуса Хрыста за кутні камень,
21 на якім уся пабудова, разам змацаваная, расьце ў сьвятую бажніцу ў Госпадзе,
22 на якім і вы разам будуецеся на жытло Божае Духам.

Эф 3

1 Дзеля гэтага вось я, Павал, — вязень Ісуса Хрыста за вас, паганаў.
2 Як вы чулі пра распарадкаваньне ласкі Божае, дадзенае мне дзеля вас,
3 што паводле адкрыцьця Ён аб'явіў мне таямніцу, (як я коратка напісаў вышэй,
4 з чаго, чытаючы, можаце зразумець маё разуменьне таямніцы Хрыстовай),
5 якая ў іншых пакаленьнях не была вядомая сынам чалавечым, як цяпер адкрыта сьвятым апосталам Ягоным і прарокам праз Духа,
6 што і пагане ёсьць суспадчыньнікамі, і адным целам, і супольнікамі абяцаньня Ягонага ў Хрысьце праз Эвангельле,
7 якога я стаўся служыцелем паводле дару ласкі Божае, дадзенае мне дзеяньнем сілы Яго.
8 Мне, найменшаму з усіх сьвятых, дадзена ласка гэтая — сярод паганаў дабравесьціць пра недасьледнае багацьце Хрыстовае
9 і зрабіць яўным для ўсіх, якое ёсьць распарадкаваньне таямніцы, што схаваная ад вякоў у Богу, Які стварыў усё праз Ісуса Хрыста,
10 каб цяпер праз Царкву сталася вядомаю начальствам і ўладам у нябёсах разнастайная мудрасьць Божая,
11 паводле адвечнага вызначэньня, якое Ён зрабіў у Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым,
12 у Якім маем адвагу і доступ з пэўнасьцю праз веру ў Яго.
13 Таму прашу вас не журыцца з прычыны прыгнёту майго дзеля вас, бо гэта ёсьць слава вашая.
14 Дзеля гэтага схіляю калені мае перад Айцом Госпада нашага Ісуса Хрыста,
15 ад Якога мае назоў усякае бацькоўства ў небе і на зямлі,
16 каб Ён даў вам, паводле багацьця славы Сваёй, сілай умацавацца праз Духа Ягонага ва ўнутраным чалавеку,
17 каб Хрыстос пасяліўся праз веру ў сэрцах вашых,
18 каб вы, укараніўшыся і ўмацаваўшыся ў любові, здолелі сьцяміць разам з усімі сьвятымі, што ёсьць шырыня і даўжыня, глыбіня і вышыня,
19 і зразумець любоў Хрыстовую, якая вышэй за разуменьне, каб вам напоўніцца ўсёю поўняй Божаю.
20 А Таму, Хто сілаю, якая дзейнічае ў нас, можа зрабіць нашмат больш за ўсё, пра што мы просім або разумеем,
21 Яму слава ў Царкве ў Хрысьце Ісусе ў-ва ўсіх пакаленьнях на вякі вякоў. Амэн.

Эф 4

1 Дык я, вязень у Госпадзе, малю вас хадзіць дастойна пакліканьня, якім вы пакліканыя,
2 з усёй пакорай розуму і ціхасьцю, з доўгацярплівасьцю, церпячы адзін аднаго з любоўю,
3 намагаючыся захаваць еднасьць духа ў саюзе супакою.
4 Адно Цела і адзін Дух, як вы і пакліканыя да аднае надзеі вашага пакліканьня;
5 Адзін Госпад, адна вера, адно хрышчэньне,
6 Адзін Бог і Айцец усіх, Які над усімі, і праз усіх, і ў-ва ўсіх вас.
7 А кожнаму з нас дадзена ласка паводле меры дару Хрыстовага.
8 Дзеля гэтага і кажа: «Узыйшоўшы на вышыню, паланіў палон і даў дары людзям».
9 А «ўзыйшоў» што ёсьць, як ня тое, што ён спачатку зыходзіў у прадонныя месцы зямлі?
10 Зыйшоўшы, Ён ёсьць і Той, Які ўзыйшоў вышэй за ўсе нябёсы, каб споўніць усё.
11 І Ён паставіў адных апосталамі, другіх прарокамі, іншых эвангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі
12 дзеля ўдасканальваньня сьвятых на справу служэньня, на будаваньне Цела Хрыстовага,
13 пакуль усе дойдзем да еднасьці веры і пазнаньня Сына Божага, да мужа дасканалага, да меры ўзросту поўні Хрыстовае,
14 каб мы не былі больш немаўлятамі, якіх хістае і захапляе ўсякі вецер вучэньня ў хітрыках чалавечых, у подступе хітрага падману,
15 але каб, кажучы праўду ў любові, узрасталі ў-ва ўсім у Таго, Які ёсьць Галава, — Хрыстос,
16 з Якога ўсё Цела, складзенае і злучанае ўсякімі вязямі дапамогі, праз дзейнасьць у сваю меру кожнага члена, расьце дзеля будаваньня самога сябе ў любові.
17 Дык кажу гэта і сьведчу ў Госпадзе, каб вы больш не хадзілі, як іншыя народы ходзяць, у марнасьці розуму свайго,
18 з зацемненым разуменьнем, адлучаныя ад жыцьця Божага праз няведаньне, якое ў іх праз скамяненьне сэрца іхняга.
19 Яны, стаўшыся нячулымі, аддаліся бессаромнасьці, каб рабіць усякую нячыстасьць з хцівасьцю.
20 Але вы ня гэтак пазналі Хрыста,
21 калі чулі Яго і ў Ім навучыліся, — бо праўда ў Ісусе,—
22 каб адкінуць вам ранейшы лад жыцьця старога чалавека, які зьнішчаецца ў манлівых пажаданьнях,
23 а абнавіцца духам розуму вашага
24 і апрануцца ў новага чалавека, які створаны паводле Бога ў праведнасьці і сьвятасьці праўды.
25 Дзеля гэтага, адкінуўшы хлусьню, гаварыце кожны праўду бліжняму свайму, бо мы члены адзін аднаму.
26 Гневайцеся, ды не грашыце: няхай сонца не заходзіць у гневе вашым;
27 і не давайце месца д’яблу.
28 Хто краў, няхай больш не крадзе, а лепш працуе, робячы добрае рукамі сваімі, каб меў што даць таму, хто мае патрэбу.
29 Аніякае благое слова няхай не выходзіць з вуснаў вашых, а толькі добрае дзеля збудаваньня ў веры, каб ласку давала тым, што слухаюць.
30 І не засмучайце Сьвятога Духа Божага, Якім вы запячатаныя на дзень адкупленьня.
31 Усякая горыч, і ярасьць, і гнеў, і крык, і блюзьнерствы няхай будуць аддаленыя ад вас разам з усім ліхім.
32 Будзьце ж адзін да аднаго добрымі, спагадлівымі, прабачаючы адзін аднаму, як і Бог у Хрысьце прабачыў вам.

Эф 5

1 Дык будзьце пераймальнікамі Бога, як дзеці ўлюбёныя,

2 і хадзіце ў любові, як і Хрыстос палюбіў нас і выдаў Сябе за нас, як дар і ахвяру Богу, на водар
салодкі.
3 А распуста і ўсякая нячыстасьць або хцівасьць няхай і не называюцца ў вас, як і належыць
сьвятым,
4 ані агідныя і пустыя словы або жарты непрыстойныя, але лепш падзяка.
5 Бо ведайце, што ніякі распусьнік, або нячысты, або хцівец, які зьяўляецца
ідалапаклоньнікам, ня мае спадчыны ў Валадарстве Хрыста і Бога.
6 Няхай ніхто не падманвае вас пустымі словамі, бо за гэта прыходзіць гнеў Божы на сыноў
непакорнасьці.
7 Дык ня будзьце супольнікамі іх.
8 Вы былі некалі цемрай, а цяпер — сьвятло ў Госпадзе; хадзіце ж, як дзеці сьвятла,
9 бо плод Духа ёсьць у-ва ўсякай добрасьці, і праведнасьці, і праўдзе.
10 Выпрабоўвайце, што падабаецца Богу,
11 і ня ўдзельнічайце ў бясплодных справах цемры, а лепш дакарайце.
12 Бо пра тое, што робіцца імі патаемна, сорамна і гаварыць.
13 Але ўсё, дакаранае сьвятлом, робіцца яўным, бо ўсё, што робіцца яўным, ёсьць сьвятло,
14 таму сказана: «Устань, ты, які сьпіш, і ўваскрэсьні з мёртвых, і асьвеціць цябе Хрыстос».
15 Дык глядзіце, хадзіце дакладна, не як бязглуздыя, але як мудрыя,
16 выкупляючы час, бо дні злыя.
17 Дзеля гэтага ня будзьце неразумнымі, але пазнавайце, якая ёсьць воля Госпада.
18 І не ўпівайцеся віном, бо ў ім распуста, але напаўняйцеся Духам,
19 гаворачы да сябе псальмамі, і гімнамі, і сьпевамі духоўнымі, сьпяваючы і граючы Госпаду ў
сэрцах вашых,
20 дзякуючы заўсёды і за ўсё Богу і Айцу ў імя Госпада нашага Ісуса Хрыста,
21 падпарадкоўваючыся адзін аднаму ў страху Божым.
22 Жанчыны, падпарадкоўвайцеся мужам сваім, як Госпаду,
23 бо муж ёсьць галава жонкі, як і Хрыстос — галава Царквы, і Ён жа — Збаўца цела.
24 Але як Царква падпарадкоўваецца Хрысту, гэтак і жонкі сваім мужам у-ва ўсім.
25 Мужы, любіце жонак сваіх, як і Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе,
26 каб асьвяціць яе, ачысьціўшы абмыцьцём водным у слове,
27 каб паставіць яе Сабе слаўнаю Царквою, бяз плямы, ці заганы, ці чаго падобнага, але каб яна
была сьвятая і беззаганная.
28 Гэтак павінны мужы любіць сваіх жонак, як целы свае: хто любіць жонку сваю, самога сябе
любіць.
29 Бо ніхто ніколі ня меў нянавісьці да цела свайго, але жывіць і грэе яго, як і Госпад Царкву.
30 Бо мы — члены цела Яго, ад цела Яго і ад костак Яго.
31 Дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку свайго і маці, і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое
адным целам.
32 Таямніца гэтая вялікая; а я кажу пра Хрыста і Царкву.
33 Зрэшты, і вы, кожны па сабе, няхай любіць жонку сваю як сябе; а жонка няхай баіцца мужа.

Эф 6

1 Дзеці, слухайцеся бацькоў сваіх у Госпадзе, бо ў гэтым праведнасьць.
2 «Шануй бацьку твайго і маці», — гэта першае прыказаньне з абяцаньнем:
3 «каб было табе добра, і быў ты даўгалетнім на зямлі».
4 І вы, бацькі, не раздражняйце дзяцей вашых, але выхоўвайце іх у дысцыплінаваньні і
напамінаньні Госпадавым.
5 Слугі, слухайцеся гаспадароў паводле цела, са страхам і трымценьнем, у шчырасьці сэрца
вашага, як Хрыста,
6 не на вачах толькі паслугуючы, як тыя, што людзям дагаджаюць, але як слугі Хрыстовыя,
якія выконваюць волю Божую ад душы,

7 з зычлівасьцю служачы Госпаду, а ня людзям,
8 ведаючы, што кожны, хто зробіць добрае, атрымае тое самае ад Госпада, ці ён нявольнік, ці вольны.
9 І вы, гаспадары, тое самае рабіце ім, паслабляючы пагрозы, ведаючы, што і ў вас саміх Госпад ёсьць у небе, і ў Яго няма ўзіраньня на аблічча.
10 Нарэшце, браты мае, умацоўвайцеся ў Госпадзе і ва ўладзе магутнасьці Яго.
11 Апраніцеся ў-ва ўсю зброю Божую, каб маглі ўстаяць супраць хітрыкаў д'ябла,
12 бо нашая барацьба ня супраць крыві і цела, але супраць начальстваў, супраць уладаў, супраць сусьветных дзяржаўцаў цемры гэтага веку, супраць духаў зласьлівасьці ў нябёсах.
13 Дзеля гэтага вазьміце ўсю зброю Божую, каб вы маглі супрацьстаць у дзень злы і, усё зрабіўшы, застацца стаяць.
14 Дык станьце, падперазаўшы паясьніцу вашую праўдаю, і апрануўшы панцыр праведнасьці,
15 і абуўшы ногі ў гатовасьць дабравесьціць супакой,
16 і па-над усё ўзяўшы шчыт веры, якім зможаце затушыць усе распаленыя стрэлы злога.
17 І шалом збаўленьня прыйміце, і меч Духа, які ёсьць слова Божае.
18 Усякаю малітваю і просьбаю маліцеся ў-ва ўсякі час у Духу, і ў-ва ўсім гэтым чувайце з усёй настойлівасьцю і просьбамі за ўсіх сьвятых
19 і за мяне, каб мне дадзена было слова, адчыніўшы вусны мае, адважна паведамляць таямніцу Эвангельля,
20 дзеля якога я спаўняю пасольства ў ланцугах, каб у ім я гаварыў адважна, як і мушу гаварыць.
21 А каб і вы ведалі пра мяне, што я раблю, усё вам паведаміць Тыхік, улюбёны брат і верны служыцель у Госпадзе,
22 якога я і паслаў да вас дзеля гэтага самага, каб вы даведаліся пра нас і каб ён суцешыў сэрцы вашыя.
23 Супакой братам і любоў з вераю ад Бога Айца і Госпада Ісуса Хрыста.
24 Ласка з усімі, якія любяць Госпада нашага Ісуса Хрыста ў незьнішчальнасьці. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ФІЛІПЯНАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал і Цімафей, слугі Ісуса Хрыста, — усім сьвятым у Хрысьце Ісусе, якія ў Філіпах, з
епіскапамі і дыяканамі:
2 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
3 Дзякую Богу майму пры ўсякім успаміне пра вас,
4 заўсёды ў кожнай просьбе маёй за ўсіх вас просячы з радасьцю,
5 за вашую супольнасьць у Эвангельлі ад першага дня аж да цяперашняга,
6 маючы пэўнасьць у тым, што Той, Які пачаў у вас добрую справу, будзе зьдзяйсьняць [яе] аж
да дня Ісуса Хрыста,
7 як справядліва мне думаць адносна ўсіх вас, бо я маю вас у сэрцы як у путах маіх, так і ў
абароне, і ў сьцьвярджэньні Эвангельля, вас, якія ўсе — удзельнікі са мною ў ласцы.
8 Бо Бог мне сьведка, як я прагну [агарнуць] усіх вас сэрцам Ісуса Хрыста;
9 і малюся пра тое, каб любоў вашая яшчэ больш і больш памнажалася ў пазнаньні і ўсякім
разуменьні,
10 каб, выпрабоўваючы, што лепшае, вы былі чыстымі і без спатыкненьня ў дзень Хрыстовы,
11 напоўненымі пладамі праведнасьці праз Ісуса Хрыста на славу і пахвалу Божую.
12 Хачу, браты, каб вы даведаліся, што тое, што са мной [сталася], выйшла больш на посьпех
Эвангельля,
13 так што путы мае ў Хрысьце сталіся яўнымі ў-ва ўсёй прэторыі і ўсім іншым,
14 і многія з братоў у Госпадзе, перакананыя путамі маімі, яшчэ больш адважыліся бяз страху
гаварыць Слова.
15 Некаторыя, праўда, — з зайздрасьці і сваркі, а некаторыя — з упадабаньня абвяшчаюць
Хрыста.
16 Тыя, што ў сварлівасьці, — прапаведуюць Хрыста ня чыста, мяркуючы павялічыць прыгнёт
путаў маіх,
17 а тыя, што ў любові, — ведаючы, што дзеля абароны Эвангельля я пастаўлены.
18 Бо што з гэтага? Усякім чынам, ці дзеля віду, ці праўдзіва, Хрыстос прапаведуецца, і я з
гэтага радуюся і буду радавацца.
19 Бо я ведаю, што гэта станецца мне на збаўленьне праз вашыя просьбы і дапамогу Духа Ісуса
Хрыста,
20 паводле спадзяваньня і надзеі маёй, што я ні ў чым ня буду асаромлены, але з усёй адвагай,
як заўсёды, гэтак і цяпер, будзе ўзьвялічаны Хрыстос у целе маім, ці то жыцьцём, ці то
сьмерцю.
21 Бо для мяне жыцьцё — Хрыстос, і сьмерць — набытак.
22 А як жыцьцё ў целе [дае] плод маёй справе, ня ведаю, што і выбраць.
23 Бо цягне адно і другое. Маю жаданьне разьвязацца і быць з Хрыстом, і гэта нашмат лепш,
24 а заставацца ў целе больш патрэбна дзеля вас.
25 І я напэўна ведаю, што застануся і затрымаюся з усімі вамі дзеля вашага посьпеху і радасьці
веры,
26 каб пахвала вашая ў Хрысьце Ісусе памнажалася ў-ва мне, калі зноў прыйду да вас.
27 Толькі жывіце дастойна Эвангельля Хрыстовага, каб мне, ці як прыйду і ўбачу вас,
ці адсутны, чуць пра вас, што вы стаіцё ў адным духу, змагаючыся аднадушна за веру
Эвангельскую
28 і ані ў чым не палохаючыся супраціўнікаў. Гэта для іх ёсьць доказ загубы, а для вас —
збаўленьня, і гэта ад Бога,
29 бо вам дадзена дзеля Хрыста ня толькі верыць у Яго, але і цярпець дзеля Яго,
30 маючы такое самае змаганьне, якое вы бачылі ў-ва мне і цяпер чуеце пра мяне.

Флп 2

1 Дык калі ёсьць якое пацяшэньне ў Хрысьце, калі ёсьць якая патоля любові, калі ёсьць якая
супольнасьць Духа, калі ёсьць якая сардэчнасьць і міласэрнасьць,
2 дапоўніце маю радасьць, каб вы тое самае думалі, тую самую любоў мелі, былі аднадушныя
і аднадумныя,
3 нічога ня [робячы] дзеля сварлівасьці ці дзеля пустое пахвальбы, але ў пакоры розуму
шануючы адзін аднога як вышэйшых за сябе.
4 Не на сваё [толькі] няхай кожны зважае, але і на тое, што іншых.
5 Бо няхай тое ў вас думаецца, што і ў Хрысьце Ісусе,
6 Які, маючы постаць Бога, не лічыў захопам быць роўным Богу,
7 але прынізіў Сябе, прыняўшы постаць слугі, стаўшыся на падабенства людзей і знойдзены
выглядам, як чалавек,
8 панізіў Сябе, стаўшыся паслухмяным ажно да сьмерці, і сьмерці крыжовай.
9 Дзеля гэтага і Бог узвысіў Яго і даў Яму імя па-над усякае імя,
10 каб у імя Ісуса схілілася ўсякае калена нябесных, зямных і падземных
11 і каб усякі язык вызнаваў, што Госпад Ісус Хрыстос у славу Бога Айца.
12 Так што, улюбёныя мае, як вы заўсёды слухаліся, ня толькі, калі я прыходзіў, але шмат
больш цяпер, у адсутнасьць маю, са страхам і трымценьнем зьдзяйсьняйце збаўленьне сваё,
13 бо Бог ёсьць Той, Які дзейнічае ў вас паводле ўпадабаньня [Свайго], каб вы і хацелі, і
дзейнічалі.
14 Усё рабіце без нараканьняў і хістаньняў,
15 каб вы былі беззаганнымі і шчырымі дзецьмі Божымі, беззаганнымі сярод пакаленьня
скрыўленага і сапсаванага, у якім вы сьвеціце, як сьвятло ў сьвеце,
16 захоўваючы слова жыцьця, на пахвалу маю ў дзень Хрыстовы, што я не надарма бег і не
надарма працаваў.
17 Але калі я і ахвяруюся на ахвяру і служэньне веры вашай, я радуюся, і радуюся разам з усімі
вамі.
18 З гэтага самага і вы радуйцеся, і радуйцеся разам са мною.
19 А я спадзяюся ў Госпадзе Ісусе хутка паслаць да вас Цімафея, каб і я ўсьцешыўся,
даведаўшыся пра вас.
20 Бо ня маю нікога роўнага душою, хто б гэтак шчыра пра вас клапаціўся.
21 Бо ўсе шукаюць свайго, а не таго, што Хрыста Ісуса.
22 А яго выпрабаванасьць вы ведаеце, бо ён, як сын бацьку, служыў мне дзеля Эвангельля.
23 Дык я спадзяюся паслаць яго неадкладна, як толькі даведаюся адносна сябе.
24 Бо я пэўны ў Госпадзе, што і сам хутка прыйду.
25 Я палічыў патрэбным паслаць да вас Эпафрадыта, брата, і супрацоўніка, і таварыша майго,
а вашага пасланца і служыцеля ў патрэбе маёй,
26 бо ён жадаў [бачыць] усіх вас і тужыў, што вы пачулі пра нядужасьць ягоную.
27 Бо ён быў хворы амаль сьмяротна; але Бог зьлітаваўся над ім, дый не над ім толькі, але і
нада мною, каб ня меў я смутку да смутку.
28 Дык я хутчэй паслаў яго, каб вы, убачыўшы яго ізноў, узрадаваліся, і каб я ня быў засмучаны.
29 Дык прыйміце яго ў Госпадзе з усякай радасьцю і гэтакіх мейце ў паважаньні,
30 бо ён за справу Хрыстовую быў блізкі да сьмерці, ня дбаючы пра душу [сваю], каб дапоўніць
нястачу служэньня вашага мне.

Флп 3

1 Нарэшце, браты мае, радуйцеся ў Госпадзе. Пісаць вам гэта для мяне ня цяжка, а для вас
карысна.
2 Зважайце на сабак, зважайце на благіх работнікаў, зважайце на нібыта абрэзаных,
3 бо абрэзаныя — гэта мы, якія служым Богу духам, і хвалімся ў Хрысьце Ісусе, і ня ў целе маем
спадзяваньне;
4 хоць я маю пэўнасьць і ў целе. Калі хто іншы думае спадзявацца на цела, дык я больш,

5 абрэзаны ў восьмы дзень, з роду Ізраіля, з калена Бэн'яміна, Гебрай з Гебраяў, паводле Закону
— фарысэй,
6 які праз руплівасьць перасьледаваў Царкву, паводле праведнасьці, якая з Закону, —
беззаганны.
7 Але тое, што для мяне было набыткам, дзеля Хрыста я палічыў за страту.
8 І больш таго, усё лічу за страту дзеля вышэйшага пазнаньня Хрыста Ісуса, Госпада майго,
дзеля Якога я ўсё страціў і лічу за гной, каб Хрыста здабыць
9 і апынуцца ў Ім, маючы не маю праведнасьць, якая праз Закон, але тую, якая праз веру ў
Хрыста, праведнасьць ад Бога праз веру,
10 каб пазнаць Яго, і сілу ўваскрасеньня Яго, і супольнасьць пакутаў Яго, прыпадабняючыся
сьмерці Яго,
11 каб толькі дасягнуць паўстаньня з мёртвых.
12 Не таму, што я ўжо атрымаў ці ўжо споўніў [усё], але імкнуся, ці не дасягну і я таго, як мяне
дасягнуў Хрыстос Ісус.
13 Браты, я не лічу сябе, што дасягнуў, а толькі, забываючыся пра тое, што ззаду, і імкнучыся
да таго, што наперадзе,
14 імчу да мэты, да ўзнагароды пакліканьня Божага, якое з гары ў Хрысьце Ісусе.
15 Дык усе, хто дасканалыя, будзем думаць гэтак. А калі вы што іначай думаеце, і гэтае Бог
вам адкрые.
16 Па-за гэтым, чаго мы дасягнулі, паводле гэтага правіла будзем хадзіць і гэтак думаць.
17 Будзьце падобнымі, браты, да мяне, і зважайце на тых, хто гэтак ходзіць, паводле ўзору, які
маеце ў нас.
18 Бо многія, пра якіх я часта казаў вам, а цяпер і са сьлязьмі кажу, ходзяць як ворагі крыжа
Хрыстовага.
19 Іхні канец — загуба, іхні бог — чэрава, і слава [іхняя] ў сораме іх, яны думаюць пра зямное.
20 А нашае грамадзянства — у небе, адкуль мы і чакаем Збаўцу, Госпада Ісуса Хрыста,
21 Які зьменіць выгляд цела паніжэньня нашага, каб яно сталася падобным да цела славы Яго,
дзеяньнем, якім Ён дзейнічае і падпарадкоўвае Сабе ўсё.

Флп 4

1 Так што, браты мае ўлюбёныя і пажаданыя, радасьць і вянок мой, стойце так у Госпадзе,
улюбёныя.
2 Эўводзію прашу і Сынтыхею прашу думаць гэтаксама ў Госпадзе.
3 Прашу і цябе, шчыры памочніку, дапамагай тым, якія змагаліся дзеля Эвангельля разам са
мною, і з Клемэнтам, і з іншымі супрацоўнікамі маімі, імёны якіх у кнізе жыцьця.
4 Радуйцеся заўсёды ў Госпадзе. Ізноў кажу: радуйцеся.
5 Спагаднасьць вашая няхай будзе вядомая ўсім людзям. Госпад блізка!
6 Не турбуйцеся ні пра што, але ў-ва ўсякай малітве і просьбе з падзякай няхай адкрываюцца
жаданьні вашыя перад Богам,
7 і супакой Божы, які вышэй за ўсякі розум, няхай захавае сэрцы вашыя і думкі вашыя ў
Хрысьце Ісусе.
8 Нарэшце, браты, што ёсьць праўдзівае, што сумленнае, што справядлівае, што чыстае, што
вартае любові, што добрай славы, калі ёсьць якая цнота і якая пахвала, — пра тое думайце.
9 І чаго вы навучыліся, і што прынялі, і чулі, і бачылі ў-ва мне, тое рабіце, і Бог супакою будзе
з вамі.
10 Я вельмі ўзрадаваўся ў Госпадзе, што вы ўжо зноў ажывіліся, каб думаць пра мяне, як і раней
думалі, ды ня мелі нагоды.
11 Ня дзеля таго, што я ў нястачы, кажу, бо я навучыўся быць задаволеным тым, што ў мяне
ёсьць.
12 Ведаю, як у паніжэньні быць, і ведаю, як у дастатку; навучыўся ўсяго і ў-ва ўсім: і насычацца,
і галадаваць, мець і дастатак, і нястачу.
13 Усё магу ў Хрысьце, Які ўмацоўвае мяне.

14 Па-за гэтым, вы добра зрабілі, што ўдзельнічалі ў маім прыгнёце.
15 Вы ж ведаеце, Філіпяне, што на пачатку [абвяшчэньня] Эвангельля, калі я выйшаў з
Македоніі, ніводная царква не далучылася да мяне праз дораньне і прыняцьцё, акрамя вас
адных.
16 Вы і ў Тэсалоніку і раз, і два пасылалі паводле патрэбы маёй.
17 Ня тое, каб я шукаў дару, але шукаю плоду, які памнажаецца на вашу карысьць.
18 Я маю ўсё і маю дастатак; я напоўнены, атрымаўшы ад Эпафрадыта тое, што ад вас, водар
салодкі, ахвяру прыемную, якая падабаецца Богу.
19 А Бог мой няхай напоўніць усякую патрэбу вашую паводле багацьця Свайго ў славе, у
Хрысьце Ісусе.
20 Богу ж і Айцу нашаму слава на вякі вякоў. Амэн.
21 Прывітайце кожнага сьвятога ў Хрысьце Ісусе. Вітаюць вас браты, што са мною.
22 Вітаюць вас усе сьвятыя, а найбольш тыя, што з дому цэзара.
23 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА КАЛАСЯНАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, апостал Ісуса Хрыста з волі Божай, і Цімафей, брат, —
2 тым, што ў Калосах, сьвятым і верным братам у Хрысьце: ласка вам і супакой ад Бога Айца
нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
3 Дзякуем Богу і Айцу Госпада нашага Ісуса Хрыста, заўсёды молячыся пра вас,
4 пачуўшы пра веру вашую ў Хрыста Ісуса і пра любоў да ўсіх сьвятых,
5 дзеля надзеі, якая вызначана вам у небе, пра што вы раней чулі ў слове праўды Эвангельля,
6 якое ёсьць у вас, як і ў-ва ўсім сьвеце, і дае плод, як і між вамі, з таго дня, калі вы пачулі і
пазналі ласку Божую ў праўдзе,
7 як і навучыліся ад Эпафраса, улюбёнага таварыша нашага, які ёсьць верным за вас
служыцелем Хрыста,
8 які і паведаміў нам пра вашую любоў у духу.
9 Дзеля гэтага і мы з таго дня, як пачулі, не перастаем маліцца за вас і прасіць, каб вы былі
напоўненыя пазнаньнем волі Яго ў-ва ўсякай мудрасьці і разуменьні духоўным,
10 каб вы хадзілі дастойна Госпада, у-ва ўсім дагаджаючы [Яму], даючы плод у кожнай добрай
справе і ўзрастаючы ў пазнаньні Бога,
11 дужэючы ўсякаю сілаю паводле магутнасьці славы Яго на ўсякую цярплівасьць і
доўгацярплівасьць з радасьцю,
12 дзякуючы Айцу, Які даў нам здольнасьць удзельнічаць у спадчыне сьвятых у сьвятле,
13 Які выбавіў нас ад улады цемры і перамясьціў у Валадарства Сына любові Сваёй,
14 у Якім мы маем адкупленьне праз кроў Ягоную і адпушчэньне грахоў.
15 Ён ёсьць вобраз Бога нябачнага, Першародны ўсякага стварэньня;
16 бо ў Ім створана ўсё, што ў небе і што на зямлі, бачнае і нябачнае: ці то пасады, ці то
панаваньні, ці то начальствы, ці то ўлады, — усё праз Яго і для Яго створана;
17 і Ён ёсьць перад усім, і ўсё ў Ім стаіць.
18 І Ён ёсьць галава Цела — Царквы; Ён — Пачатак, Першародны з мёртвых, каб быць Яму ў-ва
ўсім першым,
19 бо было даспадобы, каб у Ім жыла ўсякая поўня
20 і каб праз Яго пагадзіць з Сабою ўсё, учыніўшы праз Яго, праз кроў крыжа Ягонага мір і з
тым, што на зямлі, і з тым, што ў небе.
21 І вас, якія былі некалі адлучаныя і ворагі, разуменьнем [зьвернутыя] да злых справаў,
22 цяпер пагадзіў ва ўласным целе Яго праз сьмерць, каб паставіць вас сьвятымі, і
беззаганнымі, і бездакорнымі перад Сабою,
23 калі толькі застаецеся ў веры цьвёрда і непарушна, і не адпадаеце ад надзеі Эвангельля, якое
вы чулі, якое абвешчана ўсяму стварэньню пад небам, якога я, Павал, стаўся служыцелем.
24 Цяпер я радуюся ў пакутах маіх за вас і дапаўняю нястачу ў целе маім прыгнётаў Хрыстовых
за Цела Ягонае, якое ёсьць Царква,
25 якой я стаўся служыцелем паводле распарадкаваньня Божага, дадзенага мне дзеля вас, каб
споўніць слова Божае,
26 тайну, схаваную ад вякоў і ад пакаленьняў, а цяпер выяўленую сьвятым Ягоным,
27 якім захацеў Бог паведаміць, якое багацьце славы тайны гэтай сярод паганаў, якая ёсьць
Хрыстос у вас, надзея славы,
28 Якога мы прапаведуем, настаўляючы ўсякага чалавека і вучачы ўсякага чалавека ўсякае
мудрасьці, каб нам паставіць усякага чалавека дасканалым у Хрысьце Ісусе,
29 дзеля чаго я і працую, змагаючыся паводле дзеяньня Яго, якое дзейнічае ў-ва мне магутна.

Кал 2

1 Бо хачу, каб вы ведалі, якую вялікую барацьбу я маю дзеля вас і дзеля тых, што ў Ляадыкеі, і
дзеля ўсіх, якія ня бачылі аблічча майго ў целе,
2 каб суцешыліся сэрцы іхнія, злучаныя ў любові і дзеля ўсякага багацьця пэўнага разуменьня,
дзеля пазнаньня тайны Бога — і Айца, і Хрыста,
3 у Якім усе скарбы мудрасьці і веданьня схаваныя.
4 А кажу гэта, каб хто ня ўвёў вас у зман пераканаўчымі словамі.
5 Бо хоць я і адсутны целам, але духам я з вамі, радуючыся і бачачы ваш парадак і
ўмацаванасьць веры вашае ў Хрыста.
6 Дык як вы прынялі Хрыста Ісуса, Госпада, так хадзіце ў Ім,
7 укарэненыя і збудаваныя ў Ім, і сьцьверджаныя ў веры, як вы былі навучаныя, багацеючы ў
ёй з падзякаю.
8 Глядзіце, каб хто не збаламуціў вас філасофіяй і пустым падманам паводле традыцыі
чалавечай, паводле стыхіяў сьвету, а не паводле Хрыста.
9 Бо ў Ім жыве ўся поўня Боства цялесна,
10 і вы напоўненыя ў Ім, Які ёсьць галава ўсякага начальства і ўлады.
11 У Ім і вы абрэзаныя абразаньнем, не рукою зробленым, якое зьняла цела грахоў цялесных,
абразаньнем Хрыстовым.
12 Пахаваныя з Ім у хрышчэньні, у Ім вы і ўваскрэсьлі праз веру ў дзеяньне Бога, Які ўваскрасіў
Яго з мёртвых,
13 і вас, якія былі мёртвыя ў грахах і неабразаньні цела вашага, Ён ажывіў разам з Ім,
дараваўшы нам усе грахі,
14 сьцёршы рукапіс пастановаў, што былі супраць нас; і забраў яго спасярод, прыбіўшы да
крыжа,
15 распрануўшы начальствы і ўлады, адважна аддаў іх на сорам, трыюмфуючы над імі ў Ім.
16 Дык няхай ніхто ня судзіць вас за ежу, ці за пітво, ці за ўдзел у сьвяце, ці маладзіку, ці субоце.
17 Гэта ёсьць цень таго, што мае быць, а цела — Хрыстовае.
18 Няхай ніхто не пазбавіць вас нагароды праз самавольнае ўпакорваньне і набажэнства
анёлам, уваходзячы ў тое, чаго ня бачыў, дарэмна ўзганарыўшыся розумам цела свайго
19 і не трымаючыся Галавы, ад якое ўсё цела, вязямі і вузламі змацаванае і злучанае, расьце
ўзрастаньнем Божым.
20 Дык калі вы памерлі разам з Хрыстом для стыхіяў сьвету, чаго ж, быццам жывучы ў сьвеце,
трымаецеся пастановаў:
21 «Не дакранайся, і не каштуй, і не чапай»,
22 што ўсё [вядзе] да сапсутасьці праз [само] ўжываньне, паводле пастановаў і вучэньня
чалавечага?
23 Гэтае слова нібыта мае мудрасьць у самавольным набажэнстве, упакорваньні і мардаваньні
цела, не ў пашане да таго, што насычае цела.

Кал 3

1 Дык калі вы ўваскрэсьлі з Хрыстом, шукайце ўзгорнага, дзе Хрыстос сядзіць праваруч Бога.
2 Пра ўзгорнае думайце, а не пра зямное,
3 бо вы памерлі, і жыцьцё вашае схаванае з Хрыстом у Богу.
4 Калі зьявіцца Хрыстос, жыцьцё нашае, тады і вы зьявіцеся разам з Ім у славе.
5 Дык мярцьвіце члены вашыя, што на зямлі: распусту, нячыстасьць, жарсьць, благое
пажаданьне і хцівасьць, якая ёсьць ідалапаклонствам,
6 за што гнеў Божы прыходзіць на сыноў непакорнасьці,
7 сярод якіх і вы раней хадзілі, калі жылі між імі.
8 А цяпер вы адкіньце ўсё: гнеў, ярасьць, ліхоту, блюзьнерствы, брыдкаслоўе з вуснаў вашых;
9 не хлусіце адзін аднаму, распрануўшыся са старога чалавека з учынкамі ягонымі
10 і апрануўшыся ў новага, які абнаўляецца ў пазнаньні паводле вобразу Таго, Хто яго стварыў,

11 дзе няма Грэка і Юдэя, абразаньня і неабразаньня, барбара, Скіфа, слугі, свабоднага, але ўсё
і ў-ва ўсім Хрыстос.
12 Дык апраніцеся, як выбраныя Божыя, сьвятыя і ўлюбёныя, у міласэрнасьць, ласкавасьць,
пакору, ціхасьць, доўгацярплівасьць,
13 церпячы адзін аднаго і прабачаючы адзін аднаму, калі хто на каго мае крыўду, як Хрыстос
дараваў вам, гэтак і вы.
14 А па-над усё [апраніцеся] ў любоў, якая ёсьць вузел дасканаласьці,
15 і няхай гаспадарыць у сэрцах вашых супакой Божы, да якога вы і пакліканыя ў адным целе,
і будзьце ўдзячныя.
16 Слова Хрыстовае няхай жыве ў вас багата, у-ва ўсякай мудрасьці; навучайце і настаўляйце
адзін аднаго псальмамі, і гімнамі, і сьпевамі духоўнымі, у ласцы сьпяваючы Госпаду ў сэрцах
вашых.
17 І ўсё, што вы робіце, словам або справаю, усё [рабіце] ў імя Госпада Ісуса, дзякуючы праз
Яго Богу і Айцу.
18 Жонкі, падпарадкоўвайцеся мужам вашым, як прыстойна ў Госпадзе.
19 Мужы, любіце жонак і ня будзьце для іх прыкрымі.
20 Дзеці, слухайцеся бацькоў у-ва ўсім, бо гэта падабаецца Госпаду.
21 Бацькі, не зьнеахвочвайце дзяцей вашых, каб яны не гублялі духа.
22 Слугі, у-ва ўсім слухайцеся паноў паводле цела, не на вачах толькі паслугуючы, як тыя, што
людзям дагаджаюць, але ў шчырасьці сэрца, баючыся Бога.
23 І ўсё, што робіце, рабіце ад душы, як для Госпада, а не для людзей,
24 ведаючы, што ад Госпада атрымаеце ў нагароду спадчыну, бо вы служыце Госпаду Хрысту.
25 А хто робіць крыўду, атрымае паводле зробленае крыўды, бо няма [ў Бога] ўзіраньня на
аблічча.

Кал 4

1 Паны, давайце слугам тое, што справядліва і што адпаведна, ведаючы, што і вы маеце Госпада
ў небе.
2 Трывайце ў малітве, чуваючы ў ёй з падзякаю;
3 молячыся таксама і за нас, каб Бог адчыніў нам дзьверы слова абвяшчаць тайну Хрыстовую,
дзеля якой я зьвязаны,
4 каб я выявіў яе так, як мушу пра яе казаць.
5 У мудрасьці хадзіце з тымі, што вонкі, выкупляючы час.
6 Слова вашае [няхай будзе] заўсёды ў ласцы [Божай], прыпраўленае сольлю, каб вы ведалі, як
кожнаму адказаць.
7 Пра мяне ўсё паведаміць вам Тыхік, улюбёны брат, і верны служыцель, і таварыш у Госпадзе,
8 якога я паслаў да вас дзеля таго, каб мне даведацца, што ў вас, і ён пацешыў сэрцы вашыя,
9 разам з Анісімам, верным і ўлюбёным братам, які з вашых. Яны паведамяць вам усё, што тут
[робіцца].
10 Вітае вас Арыстарх, вязень са мною, і Марк, пляменьнік Барнабы, пра якога вы атрымалі
прыказаньне: калі ён прыйдзе да вас, прыйміце яго,
11 і Ісус, называны Юстам, якія з абрэзаных. Яны — адзіныя супрацоўнікі дзеля Валадарства
Божага, якія былі мне суцяшэньнем.
12 Вітае вас Эпафрас, які з вашых, слуга Хрыста, які заўсёды змагаецца за вас у малітвах, каб
вы стаялі дасканалымі і напоўненымі ўсякай воляй Божай.
13 Бо сьведчу пра яго, што мае вялікую руплівасьць адносна вас і тых, што ў Ляадыкеі і Гераполі.
14 Вітае вас Лука, лекар улюбёны, і Дымас.
15 Прывітайце братоў у Ляадыкеі, і Німфана, і царкву ў доме ягоным.
16 І калі гэтае пасланьне будзе прачытана ў вас, зрабіце, каб яно было прачытана ў
Ляадыкейскай царкве; і тое, якое з Ляадыкеі, прачытайце і вы.
17 І скажыце Архіпу: «Зважай на служэньне, якое ты атрымаў у Госпадзе, каб табе споўніць
яго».

18 Прывітаньне маёю рукою, Паўлаваю. Памятайце пра путы мае. Ласка з вамі. Амэн.

ПЕРШАЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА ТЭСАЛОНЦАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, і Сілуан, і Цімафей — царкве Тэсалонцаў у Богу Айцу і Госпадзе Ісусе Хрысьце: ласка
вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
2 Дзякуем Богу заўсёды за ўсіх вас, успамінаючы вас у малітвах нашых,
3 несупынна памятаючы пра вашыя ўчынкі веры, і працу любові, і непахіснасьць надзеі на
Госпада нашага Ісуса Хрыста перад Богам і Айцом нашым,
4 ведаючы, умілаваныя Богам браты, выбраньне вашае.
5 Бо нашае Эвангельле не было ў вас у слове толькі, але і ў сіле, і ў Сьвятым Духу, і ў шматлікіх
пацьверджаньнях, як вы самі ведаеце, якімі былі мы дзеля вас між вамі.
6 І вы сталіся пераймальнікамі нашымі і Госпада, прыняўшы слова ў вялікім прыгнёце з
радасьцю Духа Сьвятога,
7 так што сталіся вы прыкладам для ўсіх, што вераць, у Македоніі і Ахаі.
8 Бо ад вас разыйшлося слова Госпадава ня толькі ў Македоніі і Ахаі, але і ў-ва ўсякае месца
дайшла вера вашая ў Бога, так што ў нас няма патрэбы штосьці гаварыць.
9 Бо яны самі расказваюць пра нас, які ўваход маем мы да вас, і як вы зьвярнуліся да Бога ад
ідалаў, каб служыць Богу жывому і праўдзіваму
10 і чакаць з неба Сына Ягонага, Якога Ён узьняў з мёртвых, Ісуса, Які выбаўляе нас ад гневу,
што надыходзіць.

1 Тэс 2

1 Вы самі ведаеце, браты, пра наш уваход да вас, што ён быў не дарэмны;
2 але, раней нацярпеўшыся і будучы зьняважанымі, як вы ведаеце, у Філіпах, мы адважыліся
ў Богу нашым гаварыць вам Эвангельле Божае з вялікім змаганьнем.
3 Бо пацяшэньне нашае ані з падману, ані з нячыстасьці, ані з хітраваньня,
4 але, як мы былі выпрабаваныя Богам, каб даверыць [нам] Эвангельле, так і гаворым, не каб
людзям падабацца, але Богу, Які выпрабоўвае сэрцы нашыя.
5 Бо ніколі не было ў нас словаў лісьлівых, як ведаеце, ані думак хцівых, Бог — сьведка!
6 Не шукалі мы славы ад людзей: ані ад вас, ані ад іншых, хоць маглі быць у паважаньні, як
Хрыстовыя апосталы,
7 але былі мы лагодныя сярод вас, як карміцелька клапоціцца пра дзетак сваіх.
8 Гэтак мы, рупячыся пра вас, пажадалі перадаць вам ня толькі Эвангельле Божае, але і душы
нашыя, бо вы сталіся нам любымі.
9 Вы памятаеце, браты, працу нашую і стому, уначы і ўдзень працуючы, каб ня быць цяжарам
каму з вас, мы абвяшчалі вам Эвангельле Божае.
10 Сьведкі вы і Бог, як сьвята, праведна і беззаганна былі мы сярод вас, якія паверылі.
11 Бо вы ведаеце, як мы кожнага з вас, як бацька дзяцей сваіх, прасілі, і пацяшалі, і сьведчылі,
12 каб вы хадзілі дастойна Бога, Які паклікаў вас у Сваё Валадарства і славу.
13 Дзеля гэтага і мы несупынна дзякуем Богу, што вы, прыняўшы пачутае ад нас слова Божае,
прынялі яго не як слова чалавечае, але як яно ёсьць у сапраўднасьці, як слова Божае, што
дзейнічае ў вас, якія паверылі.
14 Вы сталіся, браты, пераймальнікамі цэркваў Божых, што ў Юдэі, у Хрысьце Ісусе, бо і вы
гэтаксама нацярпеліся ад зямлякоў сваіх, як і тыя ад Юдэяў,
15 якія і Госпада Ісуса забілі, і сваіх прарокаў, і нас павыганялі, і Богу не падабаюцца, і ўсім
людзям супрацівяцца,
16 забараняюць нам прамаўляць да паганаў, каб тыя былі збаўленыя, і гэтак дапаўняюць грахі
свае заўсёды; але дасягнуў да іх гнеў да канца.
17 Мы ж, браты, асірочаныя вамі на кароткі час абліччам, а ня сэрцам, моцна намагаліся з
вялікім жаданьнем убачыць аблічча вашае.

18 Дзеля гэтага хацелі мы прыйсьці да вас, — асабліва я, Павал, — і раз, і два, але перашкодзіў
нам шатан.
19 Бо якая нашая надзея, ці радасьць, ці вянок пахвалы? Ці ж ня вы перад Госпадам нашым
Ісусам Хрыстом у прыйсьце Яго?
20 Бо вы — слава нашая і радасьць.

1 Тэс 3

1 Дзеля гэтага, ня могучы трываць болей, спадабалася нам застацца ў Атэнах адным,
2 і паслалі мы Цімафея, брата нашага і служыцеля Божага, і супрацоўніка нашага ў Эвангельлі
Хрыстовым, каб узмоцніць вас і суцешыць вас у веры вашай,
3 каб ніхто не пахіснуўся ў прыгнётах гэтых: бо вы самі ведаеце, што мы на гэта пастаўлены.
4 Бо мы і тады, калі ў вас былі, папярэджвалі вас, што маем зазнаць прыгнёт, як і сталася, і вы
ведаеце.
5 Дзеля гэтага і я, ня могучы вытрымаць болей, паслаў даведацца пра веру вашую, каб як не
спакусіў вас спакусьнік і ня сталася дарэмнай праца нашая.
6 Цяпер жа, калі прыйшоў да нас ад вас Цімафей і прынёс нам добрую вестку пра веру і любоў
вашую, і што заўсёды маеце добрую памяць пра нас, жадаючы нас пабачыць, як і мы вас,
7 дык мы суцешыліся адносна вас, браты, у-ва ўсіх прыгнётах і патрэбах нашых, дзеля веры
вашай,
8 бо цяпер мы жывыя, калі вы стаіцё ў Госпадзе.
9 Якую ж падзяку можам даць Богу за вас, за ўсю радасьць, якою радуемся дзеля вас перад
Богам нашым,
10 уначы і ўдзень горача молячыся, каб убачыць аблічча вашае і дапоўніць нястачу ў веры
вашай?
11 Сам жа Бог і Айцец наш і Госпад наш Ісус Хрыстос няхай накіруе шлях наш да вас!
12 А вас няхай Госпад напоўніць і перапоўніць любоўю адзін да аднаго і да ўсіх, як і мы [маем]
да вас,
13 каб умацаваць сэрцы вашыя беззаганнымі ў сьвятасьці перад Богам і Айцом нашым у
прыйсьце Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі сьвятымі Яго.

1 Тэс 4

1 Нарэшце, браты, просім вас і молім праз Госпада Ісуса, каб тое, што вы прынялі ад нас, як
мусіце вы хадзіць і падабацца Богу, яшчэ больш у вас памнажалася,
2 бо вы ведаеце, якія мы далі вам загады ад Госпада Ісуса.
3 Бо гэта ёсьць воля Божая — сьвятасьць вашая, каб вы высьцерагаліся распусты,
4 каб кожны з вас умеў захоўваць сваё начыньне ў сьвятасьці і годнасьці,
5 а ня ў жарсьцях пажадлівасьці, як пагане, што ня ведаюць Бога;
6 каб не вывышаліся і не ашуквалі ў справах брата свайго, таму што Госпад — мсьціўца за ўсё
гэтае, як і раней мы гаварылі вам і сьведчылі.
7 Бо паклікаў нас Бог не да нячыстасьці, але да сьвятасьці.
8 Дык хто гэта адкідае, той адкідае не чалавека, але Бога, Які Духа Свайго Сьвятога нам даў.
9 Адносна братняй любові няма патрэбы пісаць да вас, бо вы самі навучаны Богам любіць адзін
аднаго,
10 дый вы гэтак і робіце з усімі братамі па ўсёй Македоніі. Просім жа вас, браты, багацейце [ў
гэтым] болей
11 і намагайцеся жыць у супакоі, і рабіць сваю справу, і працаваць сваімі ўласнымі рукамі, як
мы загадалі вам;
12 каб вы хадзілі прыстойна перад тымі, што звонку, і ні ў чым ня мелі патрэбы.
13 Не хачу, каб вы, браты, ня ведалі адносна памёршых, каб вы не сумавалі, як іншыя, што ня
маюць надзеі.
14 Бо калі мы верым, што Ісус памёр і ўваскрос, дык Бог і памёршых у Ісусе прывядзе з Ім.
15 Гэта вось кажам вам словам Госпадавым, што мы, жывыя, якія засталіся да прыйсьця
Госпада, не апярэдзім памёршых,

16 бо Сам Госпад з абвяшчэньнем, з голасам арханёла і трубой Божай зыйдзе з неба, і мёртвыя
ў Хрысьце ўваскрэснуць першымі;
17 пасьля мы, жывыя, што засталіся, разам з імі падхоплены будзем на аблоках на спатканьне
з Госпадам у паветра, і гэтак заўсёды з Госпадам будзем.
18 Дык пацяшайце адзін аднаго гэтымі словамі.

1 Тэс 5

1 Адносна часоў і пораў, браты, няма патрэбы пісаць да вас,
2 бо вы самі дакладна ведаеце, што дзень Госпадаў гэтак прыйдзе, як злодзей уначы.
3 Калі вось будуць гаварыць: «Супакой і бясьпека», тады неспадзявана прыйдзе на іх
зьнішчэньне, быццам мукі радзін на цяжарную, і яны не ўцякуць.
4 Вы ж, браты, ня ў цемры, каб дзень гэты захапіў вас, як злодзей:
5 усе вы — сыны сьвятла і сыны дня, мы не належым ані ночы, ані цемры.
6 Дык ня будзем спаць, як іншыя, але чувайма і будзьма пільнымі,
7 бо тыя, што сьпяць, уначы сьпяць, і тыя, што ўпіваюцца, уначы ўпіваюцца.
8 Мы ж, якія належым дню, будзьма пільнымі, апрануўшы панцыр веры і любові і шалом надзеі
збаўленьня,
9 бо Бог не прызначыў нас на гнеў, але на атрыманьне збаўленьня праз Госпада нашага Ісуса
Хрыста,
10 Які памёр за нас, каб мы, ці чуваем, ці сьпім, з Ім разам жылі.
11 Дзеля гэтага пацяшайце сябе ўзаемна і збудоўвайце адзін аднаго, як вы і робіце.
12 Просім жа вас, браты, ведайце тых, якія працуюць у вас, і кіруюць вамі ў Госпадзе, і
настаўляюць вас,
13 і шануйце іх вельмі высока ў любові дзеля працы іхняй; жывіце ў згодзе між сабою.
14 Молім вас таксама, браты, настаўляйце свавольных, пацяшайце маладушных,
падтрымлівайце слабых, будзьце доўгацярплівымі да ўсіх.
15 Глядзіце, каб ніхто нікому не аддаваў ліхам за ліха, але заўсёды імкніцеся да дабра і адзін
для аднаго, і для ўсіх.
16 Заўсёды радуйцеся.
17 Несупынна маліцеся.
18 За ўсё дзякуйце, бо такая для вас воля Божая ў Хрысьце Ісусе.
19 Духа не гасіце.
20 Прароцтвамі не пагарджайце.
21 Усё выпрабоўвайце; добрага трымайцеся.
22 Высьцерагайцеся ад усякага роду зла.
23 Сам жа Бог супакою няхай асьвяціць вас у-ва ўсёй поўні, і ўвесь ваш дух, і душа, і цела няхай
захаваюцца без заганы ў прыйсьце Госпада нашага Ісуса Хрыста.
24 Верны Той, Які вас паклікаў; Ён і зробіць [гэта].
25 Браты! Маліцеся за нас!
26 Прывітайце ўсіх братоў пацалункам сьвятым.
27 Заклінаю вас Госпадам прачытаць гэтае пасланьне ўсім сьвятым братам.
28 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з вамі. Амэн.

ДРУГОЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА ТЭСАЛОНЦАЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, і Сілуан, і Цімафей — царкве Тэсалонцаў у Богу Айцу нашым і Госпадзе Ісусе Хрысьце:
2 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
3 Заўсёды павінны мы дзякаваць Богу за вас, браты, як належыцца, бо моцна ўзрастае вера
вашая і памнажаецца любоў кожнага адзін да аднаго між усімі вамі,
4 так што мы самі хвалімся вамі ў цэрквах Божых дзеля цярплівасьці вашай і веры ў-ва ўсіх
перасьледаваньнях вашых і прыгнётах, якія вы пераносіце,
5 на выяўленьне праведнага суду Божага, каб вам быць вартымі Валадарства Божага, дзеля
якога і пакутуеце.
6 Бо праведна перад Богам аднагарадзіць прыгнётам тым, якія вас прыгнятаюць,
7 а вам, прыгнятаным, — патоляй разам з намі ў адкрыцьці Госпада Ісуса з неба з анёламі сілы
Яго,
8 Які ў полымі агню зьдзяйсьняе помсту над тымі, што ня ведаюць Бога і не паслухмяныя
Эвангельлю Госпада нашага Ісуса Хрыста.
9 Яны атрымаюць прысуд — вечнае зьнішчэньне, ад аблічча Госпада і ад славы магутнасьці
Яго,
10 калі Ён прыйдзе ўславіцца ў сьвятых Сваіх і стацца дзівосным у дзень той у-ва ўсіх, якія
паверылі, бо вы паверылі нашаму сьведчаньню сярод вас.
11 Дзеля гэтага і молімся заўсёды за вас, каб Бог наш зрабіў вас дастойнымі пакліканьня і
споўніў з моцаю ўсякае ўпадабаньне добрасьці і справу веры,
12 каб праславілася імя Госпада нашага Ісуса Хрыста ў вас, і вы — у Ім, паводле ласкі Бога
нашага і Госпада Ісуса Хрыста.

2 Тэс 2

1 Просім вось вас, браты, дзеля прыйсьця Госпада нашага Ісуса Хрыста і нашага зграмаджэньня
перад Ім,
2 не хістайцеся пасьпешна розумам і не трывожцеся ані праз духа, ані праз слова, ані праз
пасланьне, нібы ад нас, што быццам надыйшоў дзень Хрыстовы.
3 Няхай ніхто аніяк вас ня зводзіць, бо [дзень гэты ня прыйдзе], пакуль ня прыйдзе перш
адступніцтва і не адкрыецца чалавек грэху, сын загубы,
4 які супраціўіцца і вывышаецца па-над усё, што называецца Богам ці чаму пакланяюцца, так
што ў сьвятыні Божай засядзе ён як бог, заяўляючы пра сябе, што ён — бог.
5 Ці не памятаеце, што я, яшчэ як быў у вас, гаварыў вам гэтае?
6 І цяпер ведаеце, што трымае, каб адкрыцца яму ў свой час.
7 Бо таямніца беззаконьня ўжо дзейнічае, няхай толькі той, што трымае цяпер, будзе забраны
спасярод.
8 І тады адкрыецца беззаконьнік, якога Госпад заб'е духам вуснаў Сваіх і зьнішчыць
зьяўленьнем прыйсьця Свайго,
9 таго, якога прыйсьце праз дзеяньне шатана, будзе з усёй сілаю, і знакамі, і фальшывымі
цудамі,
10 і з усякім ашуканствам няправеднасьці для тых, якія гінуць з-за таго, што не прынялі любові
праўды, каб ім быць збаўленымі.
11 І з-за гэтага пашле ім Бог дзеяньне аблуды, каб верылі хлусьні,
12 каб былі асуджаныя ўсе, якія не паверылі праўдзе, але ўпадабалі няправеднасьць.
13 А мы заўсёды павінны дзякаваць Богу за вас, улюбёныя Госпадам браты, што Бог ад пачатку,
праз асьвячэньне Духа і веру праўдзе, выбраў вас на збаўленьне,
14 да якога і паклікаў вас праз Эвангельле нашае на атрыманьне славы Госпада нашага Ісуса
Хрыста.

15 Дык, браты, стойце і трымайцеся традыцыі, якой вы навучыліся ці праз слова, ці праз
пасланьне нашае.
16 Сам жа Госпад наш Ісус Хрыстос і Бог і Айцец наш, Які палюбіў нас і даў пацяшэньне вечнае
і надзею добрую ў ласцы,
17 няхай пацешыць вашыя сэрцы і няхай умацуе вас у-ва ўсякім слове і справе добрай.

2 Тэс 3

1 Нарэшце, маліцеся за нас, браты, каб слова Госпада пашыралася і выслаўлялася, як і ў вас,
2 і каб мы былі выбаўленыя ад нягодных і злых людзей, бо не ў-ва ўсіх вера.
3 Але верны Госпад, Які ўмацуе вас і захавае ад злога.
4 Мы пэўныя адносна вас у Госпадзе, што вы выконваеце і будзеце выконваць тое, што мы
загадваем вам.
5 Няхай Сам Госпад накіруе сэрцы вашыя да любові Божае і цярплівасьці Хрыстовай.
6 Загадваем вам, браты, у імя Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб цураліся ўсякага брата, які
ходзіць свавольна і не паводле традыцыі, прынятай ад нас,
7 бо вы самі ведаеце, як трэба насьлядаваць нас, бо мы не сваволілі між вамі,
8 таксама дарма ні ў каго хлеба ня елі, але ў працы і стоме рабілі ўначы і ўдзень, каб не
абцяжарыць каго з вас,
9 не таму, што ня маем улады, але каб сябе саміх даць вам за прыклад дзеля перайманьня нас.
10 Бо калі мы былі ў вас, дык загадалі вам: калі хто ня хоча працаваць, той няхай і ня есьць.
11 Але чуем, што некаторыя ў вас ходзяць свавольна, нічога ня робяць, але мітусяцца.
12 Гэтакім загадваем і молім у Госпадзе нашым Ісусе Хрысьце, каб яны, працуючы моўчкі, елі
свой хлеб.
13 А вы, браты, не журыцеся, робячы дабро.
14 Калі ж хто не паслухаецца слова нашага праз гэтае пасланьне, таго мейце на прыкмеце і ня
мейце справы з ім, каб быў асаромлены;
15 але не лічыце яго за ворага, але настаўляйце, як брата.
16 Сам жа Госпад супакою няхай дасьць вам супакой заўсёды і ў-ва ўсім. Госпад з усімі вамі.
17 Прывітаньне маёю рукою, Паўлаваю, што ёсьць знак у-ва ўсякім пасланьні; пішу я гэтак:
18 ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. Амэн.

ПЕРШАЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА ЦІМАФЕЯ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, апостал Ісуса Хрыста паводле загаду Бога, Збаўцы нашага, і Госпада Ісуса Хрыста,
надзеі нашае, —
2 Цімафею, шчыраму дзіцяці ў веры: ласка, літасьць, супакой ад Бога, Айца нашага, і Хрыста
Ісуса, Госпада нашага.
3 Ідучы ў Македонію, я прасіў цябе быць у Эфэсе і загадаць некаторым, каб яны не навучалі
іншага
4 і не зважалі на байкі і радаводы бясконцыя, якія выклікаюць больш спрэчак, чым Божага
збудаваньня ў веры.
5 Канец жа загаду ёсьць любоў з чыстага сэрца, і добрага сумленьня, і веры некрывадушнай,
6 ад чаго адхіліўшыся, некаторыя збочылі да пустаслоўя,
7 хочучы быць законавучыцялямі, не разумеючы ані таго, што кажуць, ані таго, пра што
сьцьвярджаюць.
8 А мы ведаем, што Закон добры, калі хто законна карыстаецца ім,
9 ведаючы тое, што Закон не пастаўлены для праведніка, але для беззаконьнікаў і
непакорлівых, бязбожных і грэшнікаў, нячыстых і паганых, бацьказабойцаў і мацізабойцаў,
чалавеказабойцаў,
10 распусьнікаў, мужаложнікаў, людакрадаў, хлусьлівых, крывапрысяжнікаў і для іншых, што
супрацівяцца здароваму вучэньню,
11 паводле Эвангельля славы шчаснага Бога, якое мне даверана.
12 І я дзякую Хрысту Ісусу, Госпаду нашаму, Які ўмацаваў мяне, што Ён палічыў мяне верным,
паставіўшы на служэньне,
13 [мяне], які раней блюзьніў, і перасьледаваў, і крыўдзіў, але памілаваны, бо рабіў гэта, ня
ведаючы, у недаверстве.
14 І ласка Госпада нашага памножылася разам з вераю і любоўю ў Хрысьце Ісусе.
15 Вернае слова і ўсякага прыняцьця вартае, што Хрыстос Ісус прыйшоў у сьвет збавіць
грэшнікаў, з якіх я — першы.
16 Але дзеля таго я памілаваны, каб Ісус Хрыстос у-ва мне першым зьявіў усю
доўгацярплівасьць на прыклад тым, якія маюць верыць у Яго дзеля жыцьця вечнага.
17 Валадару ж вякоў, незьнішчальнаму, нябачнаму, адзінаму мудраму Богу пашана і слава на
вякі вякоў. Амэн.
18 Гэткі загад даю табе, дзіця [маё] Цімафей, паводле ранейшых адносна цябе прароцтваў, каб
ты змагаўся згодна з імі добрым змаганьнем,
19 маючы веру і добрае сумленьне, адкінуўшы якое, некаторыя разьбіліся ў веры;
20 з якіх Гімэнэй і Аляксандар, якіх я аддаў шатану, каб яны навучыліся ня блюзьніць.

1 Цім 2

1 Дык перш за ўсё прашу ўзносіць просьбы, малітвы, умольваньні і падзякі за ўсіх людзей,
2 за валадароў і за ўсіх, хто пры ўладзе, каб весьці нам жыцьцё ціхае і спакойнае ў-ва ўсякай
пабожнасьці і сумленнасьці,
3 бо гэта добра і прыемна перад Збаўцам нашым Богам,
4 Які хоча, каб усе людзі былі збаўленыя і прыйшлі да пазнаньня праўды.
5 Бо адзін Бог і адзін Пасярэднік паміж Богам і людзьмі — Чалавек Хрыстос Ісус,
6 Які аддаў Сябе на адкупленьне за ўсіх, як сьведчаньне ў свой час,
7 дзеля Якога я пастаўлены весьнікам і апосталам, праўду кажу ў Хрысьце, не хлушу,
настаўнікам паганаў у веры і праўдзе.
8 Дык хачу, каб на ўсякім месцы маліліся мужы, узьнімаючы сьвятыя рукі бяз гневу і
хістаньняў;

9 каб таксама і жанчыны, у сьціплай вопратцы, з сарамлівасьцю і здаровым розумам аздаблялі
сябе не пляценьнем валасоў, ані золатам, ані пэрламі, ані шатамі дарагімі,
10 але добрымі ўчынкамі, як належыць жанчынам, якія абяцалі багабойнасьць.
11 Жанчына ў маўчаньні няхай вучыцца з усякай паслухмянасьцю.
12 А жанчыне, каб навучала, не дазваляю, ані каб мужам кіравала, але каб у маўчаньні была.
13 Бо першым быў зьлеплены Адам, а пасьля — Ева;
14 і не Адам быў падмануты, а жанчына, падманутая, учыніла парушэньне,
15 але будзе збаўленая праз нараджэньне дзяцей, калі застанецца ў веры, і любові, і сьвятасьці
са здаровым розумам.

1 Цім 3

1 Вернае слова: «Калі хто епіскапства жадае, добрай справы жадае».
2 Дык епіскап мусіць быць бездакорны, аднае жонкі муж, пільны, цьвярозы, сьціплы,
гасьцінны, здольны навучаць,
3 ня п'яніца, не задзірлівы, ня сквапны, але спагадны, не ваяўнічы, не срэбралюбец,
4 каб добра сваім домам кіраваў, дзяцей меў у паслухмянасьці з усякай сумленнасьцю.
5 А калі хто ня ведае, як кіраваць уласным домам, як будзе клапаціцца пра Царкву Божую?
6 [Мусіць быць] не з нованаверненых, каб, узьбіўшыся ў пыху, ня трапіў пад прысуд з д'яблам.
7 Мусіць ён мець добрае сьведчаньне ад тых, што вонкі, каб ня трапіў у зьнявагу і пастку
д'яблаву.
8 Дыяканы таксама [мусяць быць] сумленныя, не двудушныя, не прагавітыя на віно, ня
сквапныя,
9 якія маюць таямніцу веры ў чыстым сумленьні.
10 І гэтакіх трэба перш выпрабоўваць, а пасьля, калі бездакорныя, няхай служаць.
11 Таксама жанчыны [мусяць быць] сумленныя, не паклёпніцы, пільныя, верныя ў-ва ўсім.
12 Дыяканы няхай будуць мужамі аднае жонкі, якія добра кіруюць дзецьмі і домам сваім,
13 бо хто добра паслужыў, здабывае сабе добрую ступень і вялікую адвагу ў веры ў Хрыста
Ісуса.
14 Гэтае табе пішу, спадзеючыся неўзабаве прыйсьці да цябе,
15 каб ты, калі замаруджу, ведаў, як трэба жыць у доме Божым, які ёсьць Царква Бога Жывога,
слуп і апірышча праўды.
16 І, бясспрэчна, вялікая ёсьць таямніца пабожнасьці: Бог зьявіўся ў целе, апраўдаў Сябе ў
Духу, зьявіў Сябе анёлам, абвешчаны ў народах, прыняты вераю ў сьвеце, узьнесены ў славе.

1 Цім 4

1 А Дух выразна кажа, што ў апошнія часы некаторыя адыйдуць ад веры, зважаючы на духаў
падманлівых і вучэньні дэманавы,
2 праз крывадушнасьць тых, якія кажуць фальшыва і выпалілі сумленьне сваё,
3 якія забараняюць жаніцца, [кажуць] высьцерагацца ежы, якую Бог стварыў дзеля
спажываньня з падзякай вернымі і тымі, што пазналі праўду.
4 Бо ўсякае стварэньне Божае добрае, і нішто ня мае быць адкінутым, што прыймаецца з
падзякаю,
5 бо асьвячаецца праз слова Божае і малітву.
6 Прадстаўляючы гэта братам, будзеш добрым служыцелем Ісуса Хрыста, спасіленым словамі
веры і добрым навучаньнем, за якімі ты пайшоў сьледам.
7 А паганых і бабскіх баек цурайся, але практыкуйся ў пабожнасьці.
8 Бо цялеснае практыкаваньне мала карыснае, а пабожнасьць на ўсё карысная, маючы
абяцаньне жыцьця цяперашняга і будучага.
9 Вернае [гэта] слова і ўсякага прыняцьця вартае.
10 Бо мы дзеля гэтага і працуем, і зьнявагі церпім, што спадзяемся на Бога Жывога, Які ёсьць
Збаўца ўсіх людзей, а найбольш — верных.

11 Загадвай гэта і навучай.
12 Няхай ніхто не пагарджае маладосьцю тваёй, але будзь прыкладам для верных у слове, у ладзе жыцьця, у любові, у духу, у веры, у чысьціні.
13 Пакуль прыйду, займайся чытаньнем, пацяшаньнем, навучаньнем.
14 Не занядбоўвай дару [ласкі], што ў табе, які дадзены табе праз прароцтва, з ускладаньнем рук старостаў.
15 Гэта абдумвай, у гэтым будзь, каб посьпех твой быў яўны для ўсіх.
16 Захоўвай сябе і вучэньне, трывай у гэтым, бо, гэтак робячы, і сябе збавіш, і тых, якія слухаюць цябе.

1 Цім 5

1 Старога не дакарай, але прасі, як бацьку, маладых — як братоў,
2 старых жанчынаў — як матак, маладых — як сёстраў, з усякай чысьцінёю.
3 Удоваў шануй, тых, якія праўдзіва ўдовы.
4 А калі якая ўдава мае дзяцей ці ўнукаў, яны перш няхай вучацца шанаваць свой дом і аддаваць належнае бацькам, бо гэта добра і прыемна перад Богам.
5 Праўдзівая ўдава і адзінокая спадзяецца на Бога і трывае ў малітвах і просьбах уночы і ўдзень,
6 а тая, што жыве ў распусьце, жывучы, мёртвая.
7 І гэтак загадвай, каб былі бездакорнымі.
8 А калі хто пра сваіх, і асабліва, пра хатніх ня дбае, той адрокся ад веры і горшы за бязьвернага.
9 Удава мае быць унесеная ў сьпіс, якой ня менш як шэсьцьдзясят гадоў, якая была жонкаю аднаго мужа,
10 засьведчаная ў добрых учынках, калі дзяцей выгадавала, калі прыймала падарожных, калі абмывала ногі сьвятым, калі падтрымлівала прыгнечаных, калі ішла сьледам за ўсякай добрай справай.
11 А маладым удовам адмаўляй, бо калі яны, разласаваўшыся насуперак Хрысту, захочуць замуж,
12 атрымаюць асуджэньне, бо адкінулі ранейшую веру.
13 Да таго ж яны прывучаюцца не працаваць, цягаючыся па дамах; і ня толькі не працаваць, але і балбатаць, і рабіць непатрэбныя рэчы, гаворачы, чаго ня сьлед.
14 Дык хачу, каб маладыя [ўдовы] ішлі замуж, нараджалі дзяцей, кіравалі домам і не давалі супраціўніку аніякае нагоды дзеля абмаўляньня,
15 бо некаторыя ўжо збочылі ўсьлед за шатанам.
16 Калі які верны ці верная мае ўдовы, няхай падтрымлівае іх і не абцяжарвае царквы, каб яна падтрымлівала праўдзівых удоваў.
17 Старосты, якія кіруюць добра, дастойныя падвойнае пашаны, асабліва тыя, якія працуюць у слове і навучаньні.
18 Бо Пісаньне кажа: «Не закелзай вала, які малоціць», і: «Работнік варты нагароды сваёй».
19 Абвінавачваньне на старосту не прыймай, хіба што пры двух ці трох сьведках.
20 Тых, якія грашаць, дакарай перад усімі, каб і іншыя страх мелі.
21 Перад Богам і Госпадам Ісусам Хрыстом і выбранымі анёламі сьведчу [табе], каб ты захаваў гэтае без перадузятасьці, нічога ня робячы паводле прыхільнасьці.
22 Рукі хутка ні на каго не ўскладай і ня будзь супольнікам у чужых грахах; захоўвай сябе чыстым.
23 Больш ня пі ваду, але ўжывай крыху віна дзеля страўніка твайго і частых тваіх немачаў.
24 Грахі некаторых людзей відочныя і вядуць на асуджэньне, а за некаторымі ідуць сьледам.
25 Гэтаксама і добрыя ўчынкі відочныя; і калі іначай, схавацца ня могуць.

1 Цім 6

1 Усе слугі, якія пад ярмом, няхай лічаць уладароў сваіх вартымі ўсякае пашаны, каб не было блюзьнерства на імя Божае і вучэньне.

2 Тыя ж, якія верных маюць за ўладароў, няхай не пагарджаюць імі, што яны браты, але больш
няхай служаць ім, таму што яны верныя і ўлюбёныя, удзельнікі дабрадзействаў [Божых].
Гэтага навучай і ўпрошвай.
3 Калі хто навучае іначай і не ідзе за здаровымі словамі Госпада нашага Ісуса Хрыста і за
вучэньнем пра пабожнасьць,
4 той узьбіўся ў пыху, нічога не разумеючы, але хварэючы на спрэчкі і кіданьне словамі, ад
якіх стаецца зайздрасьць, сварка, блюзьнерствы, зласьлівыя падазрэньні,
5 пустыя гутаркі між людзьмі зьнішчанага розуму і пазбаўленымі праўды, якія думаюць, што
пабожнасьць — [сродак] дзеля прыбытку. Аддаляйся ад гэтакіх.
6 Але вялікі прыбытак — пабожнасьць разам з задаволенасьцю.
7 Бо мы нічога не прынесьлі ў сьвет; зразумела, што і нічога вынесьці ня можам.
8 А маючы што есьці і што апрануць, будзем гэтым задаволеныя.
9 Тыя ж, якія хочуць багацець, трапляюць у спакусу, і ў пастку, і ў многія бяздумныя і
шкадлівыя пажаданьні, якія топяць людзей у зьнішчэньні і загубе.
10 Бо корань усякага зла ёсьць срэбралюбства, жадаючы якога, некаторыя адступіліся ад веры
і самі сябе аддалі на многія мукі.
11 А ты, чалавек Божы, уцякай ад гэтага, але імкніся да праведнасьці, пабожнасьці, веры,
любові, цярплівасьці, пакоры,
12 змагайся добрым змаганьнем веры, трымайся за жыцьцё вечнае, да якога ты і пакліканы, і
вызнаў добрае вызнаньне перад многімі сьведкамі.
13 Перад Богам, Які ўсё ажыўляе, і перад Хрыстом Ісусам, Які засьведчыў перад Понтыем
Пілатам добрае вызнаньне, загадваю табе
14 захаваць гэтае прыказаньне неапаганеным, бездакорным аж да зьяўленьня Госпада нашага
Ісуса Хрыста,
15 якое ў свой час адкрые шчасьлівы і адзіны магутны Валадар тых, хто валадарыць, і Госпад
тых, якія пануюць,
16 Адзіны, Які мае несьмяротнасьць, жыве ў сьвятле недаступным, Якога ніхто з людзей ня
бачыў і бачыць ня можа. Яму пашана і ўлада вечная. Амэн.
17 Багатым у цяперашнім веку загадвай, каб яны ня думалі шмат пра сябе і спадзяваліся не на
багацьце няпэўнае, але на Бога Жывога, Які дае нам багата ўсё дзеля прыемнасьці;
18 каб рабілі дабро, багацелі добрымі ўчынкамі, былі шчодрыя, дзяліліся,
19 зьбіраючы сабе скарб, добры падмурак дзеля будучыні, каб трымацца ім за жыцьцё вечнае.
20 О, Цімафею! Захоўвай тое, што перададзена табе, ухіляючыся ад паганага марнаслоўя і
перакорлівасьці фальшывага веданьня,
21 пахваляючыся якім, некаторыя адхіліліся ад веры. Ласка з табою. Амэн.

ДРУГОЕ ПАСЛАНЬНЕ ДА ЦІМАФЕЯ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, апостал Ісуса Хрыста воляй Божай, паводле абяцаньня жыцьця, што ў Хрысьце Ісусе,
—
2 Цімафею, улюбёнаму дзіцяці: ласка, літасьць, супакой ад Бога Айца і Хрыста Ісуса, Госпада
нашага.
3 Дзякую Богу, Якому служу ад бацькоў з чыстым сумленьнем, што няспынна ўзгадваю пра
цябе ў просьбах маіх уночы і ўдзень,
4 жадаючы бачыць цябе, памятаючы пра сьлёзы твае, каб мне напоўніцца радасьцю,
5 прыводзячы на памяць некрывадушную веру тваю, якая раней жыла ў бабулі тваёй Ляідзе і
ў маці тваёй Эўніцы, і я перакананы, што і ў табе.
6 Дзеля гэтае прычыны нагадваю табе, каб ты распальваў дар Божы, які ёсьць у табе праз
ускладаньне рук маіх,
7 бо даў нам Бог ня духа палахлівасьці, але сілы, і любові, і цьвярозага мысьленьня.
8 Дык не саромся сьведчаньня Госпада нашага, ані мяне, вязьня Ягонага, але перанось
цяжкасьці разам з Эвангельлем паводле сілы Бога,
9 Які збавіў нас і паклікаў пакліканьнем сьвятым, не паводле ўчынкаў нашых, але паводле
вызначэньня Свайго і ласкі, дадзенае нам у Хрысьце Ісусе перад вечнымі часамі,
10 а цяпер выяўленае праз зьяўленьне Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, Які зьнішчыў сьмерць і
зьявіў жыцьцё і незьнішчальнасьць праз Эвангельле,
11 для якога я пастаўлены весьнікам, і апосталам, і настаўнікам паганаў.
12 Дзеля гэтае прычыны я і цярплю гэтак, але не саромлюся, бо ведаю, у Каго я паверыў, і
перакананы, што Ён моцны, каб захаваць перададзенае праз мяне на той дзень.
13 Мей за прыклад здаровыя словы, якія ты чуў ад мяне, у веры і любові, што ў Хрысьце Ісусе.
14 Захоўвай тое добрае, што перададзена [табе], праз Духа Сьвятога, Які жыве ў нас.
15 Ты ведаеш, што адвярнуліся ад мяне ўсе, якія ў Азіі, між імі Фігел і Гермаген.
16 Няхай дасьць Госпад літасьць дому Анісіфора, бо ён часта падмацоўваў мяне і не саромеўся
ланцугоў маіх,
17 але, калі быў у Рыме, дужа шукаў мяне і знайшоў.
18 Няхай дасьць яму Госпад знайсьці літасьць у Госпада ў той дзень; і колькі ён служыў у Эфэсе,
ты лепей ведаеш.

2 Цім 2

1 Дык ты, дзіця маё, умацоўвайся ў ласцы, што ў Хрысьце Ісусе,
2 і, што чуў ад мяне праз многіх сьведкаў, тое перадай верным людзям, якія будуць здольнымі
і іншых навучыць.
3 Дык перанось злыбеды, як добры жаўнер Ісуса Хрыста.
4 Ніхто з тых, хто змагаецца, ня зьвязвае сябе справамі жыцьцёвымі, каб падабацца таму, хто
яго ўзяў у войска.
5 І калі хто спаборнічае, не атрымае вянка, калі будзе спаборнічаць незаконна.
6 Земляроб, які працуе, мусіць першы спажываць плады.
7 Разумей, што кажу. Няхай жа дасьць табе Госпад разуменьне ў-ва ўсім.
8 Памятай пра Ісуса Хрыста, з насеньня Давіда, Які ўваскрос з мёртвых паводле Эвангельля
майго,
9 у якім пераношу злыбеды аж да путаў, як злачынца, але слова Божага нельга зьвязаць.
10 Дзеля гэтага я ўсё трываю дзеля выбраных, каб і яны дасягнулі збаўленьня, што ў Хрысьце
Ісусе, з вечнаю славаю.
11 Вернае слова, што калі мы памерлі з Ім, і жыць будзем з Ім;
12 калі трываем [з Ім], і валадарыць будзем з Ім; калі адрачэмся [ад Яго], і Ён адрачэцца ад нас;
13 калі мы ня верым, Ён застаецца верным, бо ад Сябе адрачыся ня можа.

14 Гэта нагадвай, сьведчачы перад Госпадам, каб не спрачаліся дзеля словаў, што нічога не дае,
а руйнуе тых, якія слухаюць.
15 Намагайся паставіць сябе перад Богам вартым, работнікам, які ня будзе асаромлены, які
слушна пераказвае слова праўды.
16 А паганага марнаслоўя пазьбягай, бо яны яшчэ больш будуць узрастаць у бязбожнасьці,
17 і слова іхняе, як гангрэна, будзе мець пажыву. Гэтакія Гімэнэй і Філет,
18 якія адхіліліся ад праўды, кажучы, што ўваскрасеньне ўжо было, і руйнуюць у некаторых
веру.
19 Але цьвёрды падмурак Божы стаіць, маючы гэтакую пячатку: «Ведае Госпад тых, якія Яго»,
і: «Няхай адыйдзецца ад няправеднасьці кожны, хто называе імя Хрыста».
20 А ў вялікім доме ёсьць посуд ня толькі залаты і срэбны, але і драўляны, і гліняны; і адзін —
у пашане, а другі — у ганьбе.
21 Дык калі хто ачысьціць сябе ад гэтага, той будзе пасудзінаю ў пашане, асьвячонаю і
патрэбнаю Уладару, падрыхтаванаю на ўсякую добрую справу.
22 Ад юнацкіх пажаданьняў уцякай, а імкніся да праведнасьці, веры, любові, супакою з тымі,
хто прызывае Госпада ад чыстага сэрца.
23 Ад дурных і бязглуздых спрэчак адмаўляйся, ведаючы, што яны нараджаюць звадкі;
24 а слуга Госпада ня мусіць вадзіцца, але быць ветлівым да ўсіх, здольным навучаць,
цярплівым,
25 у ціхасьці настаўляць тых, якія працівяцца, ці ня дасьць ім Бог навяртаньня дзеля пазнаньня
праўды,
26 каб яны вызваліліся з пасткі д'яблавай, які злавіў іх пад сваю волю.

2 Цім 3

1 Ведай жа тое, што ў апошнія дні надыйдуць злыя часы.
2 Бо людзі будуць самалюбныя, срэбралюбцы, пыхліўцы, ганарыстыя, блюзьнеры,
непаслухмяныя бацькам, няўдзячныя, нячыстыя, бязьлітасныя,
3 няўмольныя, паклёпнікі, неапанаваныя, жорсткія, ненавісьнікі таго, што добрае,
4 здраднікі, неразважныя, фанабэрыстыя, якія больш любяць асалоду, чым Бога,
5 якія маюць выгляд пабожнасьці, а сілы яе адракліся. Ад гэтакіх адварочвайся.
6 Бо з гэтакіх тыя, што закрадаюцца ў дамы і палоняць жанчынак, абцяжараных грахамі, якіх
водзяць розныя пажадлівасьці,
7 якія заўсёды вучацца і ніколі ня могуць дайсьці да пазнаньня праўды.
8 Як Яннэс і Ямбрэс супрацьстаялі Майсею, гэтак і яны супрацьстаяць праўдзе, людзі з
папсаваным розумам, няздатныя ў веры.
9 Але яны ня шмат будуць узрастаць, бо шаленства іхняе выкрыецца перад усімі, як гэта і
сталася з тымі.
10 А ты пайшоў сьледам за мною ў навучаньні, ладзе жыцьця, намерах, веры, доўгацярплівасьці, любові, непахіснасьці,
11 перасьледваньнях, пакутах, якія здарыліся са мною ў Антыёхіі, Іконіі, Лістрах; гэтыя
перасьледваньні я перанёс, і з усіх выбавіў мяне Госпад.
12 Дый усе, якія хочуць жыць пабожна ў Хрысьце Ісусе, перасьледаваны будуць.
13 А злыя людзі і ашуканцы будуць узрастаць у зьле, падманваючы [іншых] і падманваючы
сябе.
14 А ты заставайся ў тым, чаго навучыўся і што табе даверана, ведаючы, праз каго ты навучаны;
15 і што ты з дзяцінства ведаеш Сьвятое Пісаньне, якое можа зрабіць цябе мудрым на
збаўленьне праз веру, што ў Хрысьце Ісусе.
16 Усё Пісаньне натхнёнае Богам і карыснае дзеля навучаньня, дзеля дакараньня, дзеля
выпраўленьня, дзеля дысцыплінаваньня ў праведнасьці,
17 каб дасканалым быў чалавек Божы, да ўсякае добрае справы гатовым.

2 Цім 4

1 Дык я сьведчу перад Богам і Госпадам нашым Ісусам Хрыстом, Які мае судзіць жывых і
мёртвых у зьяўленьні Сваім і Валадарства Свайго:
2 абвяшчай слова, настойвай у час і ня ў час, дакарай, забараняй, упрошвай з усякай
доўгацярплівасьцю і вучэньнем.
3 Бо будзе час, калі здаровага навучаньня цярпець ня будуць, але паводле сваіх пажаданьняў
будуць выбіраць сабе настаўнікаў, якія лашчаць слых,
4 і ад праўды слых адвернуць, а збочаць да баек.
5 А ты будзь пільны ў-ва ўсім, перанось злыбеды, рабі справу дабравесьніка, служэньне тваё
выконвай.
6 Бо я ўжо стаўся ахвяраю, і час майго адыходу прыйшоў.
7 Змагаўся я добрым змаганьнем, бег зьдзейсьніў, веру захаваў.
8 Нарэшце, вызначаны мне вянок праведнасьці, які дасьць мне Госпад, праведны Судзьдзя, у
той дзень; і ня толькі мне, але і ўсім, якія зьяўленьне Яго палюбілі.
9 Намагайся, каб хутка прыйсьці да мяне.
10 Бо Дэмас пакінуў мяне, палюбіўшы цяперашні век, і пайшоў у Тэсалоніку; Крэскенс — у
Галятыю; Ціт — у Дальматыю; адзін Лука са мною.
11 Марка, узяўшы, прывядзі з сабою, бо ён мне патрэбны для служэньня,
12 А Тыхіка я паслаў у Эфэс.
13 Плашч, які я кінуў у Траадзе ў Карпа, ідучы, прынясі, і кнігі, асабліва пэргаміны.
14 Аляксандар, меднік, шмат учыніў мне ліха. Няхай дасьць яму Госпад паводле ўчынкаў
ягоных.
15 І ты захоўвай сябе ад яго, бо ён вельмі супрацьстаіць нашым словам.
16 У першай маёй абароне ніхто не прыйшоў да мяне, але ўсе мяне пакінулі. Няхай ня будзе
ім палічана!
17 Госпад жа стаў перада мною і ўмацаваў мяне, каб пропаведзь праз мяне была выкананая і
каб пачулі [яе] ўсе пагане; і я быў выбаўлены з ільвінае пашчы.
18 І выбавіць мяне Госпад ад усякага злога дзеяньня, і збавіць для Свайго Нябеснага
Валадарства. Яму слава на вякі вякоў. Амэн.
19 Прывітай Прыскілу, і Акілу, і дом Анісіфора.
20 Эраст застаўся ў Карыньце; а Трафіма я пакінуў хворага ў Мілеце.
21 Намагайся, каб прыйсьці да зімы. Вітаюць цябе Эўбул, і Пуд, і Лін, і Кляўдыя, і ўсе браты.
22 Госпад Ісус Хрыстос з духам тваім. Ласка з вамі. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ЦІТА АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, слуга Божы, апостал жа Ісуса Хрыста, паводле веры выбраных Божых і пазнаньня
праўды паводле пабожнасьці,
2 у надзеі жыцьця вечнага, якое абяцаў Бог, Які не падманвае, перад адвечнымі часамі,
3 а ў свой час зьявіў слова Сваё ў пропаведзі, якое было даверана мне паводле загаду Збаўцы
нашага, Бога, —
4 Ціту, шчыраму дзіцяці ў супольнай веры: ласка, літасьць, супакой ад Бога Айца і Госпада
Ісуса Хрыста, Збаўцы нашага.
5 Я пакінуў цябе ў Крыце дзеля таго, каб ты ўпарадкаваў, дзе чаго не хапае, і паставіў у гарадах
старостаў, як я табе загадаў:
6 калі хто бездакорны, муж аднае жонкі, дзяцей мае верных, якіх не абвінавачваюць за
распусту або непакорлівасьць.
7 Бо епіскап мусіць быць бездакорны, як Божы аканом, не самалюбны, не гняўлівы, ня п'яніца,
не задзірлівы, ня сквапны,
8 але гасьцінны, дабралюбны, цьвярозы, праведны, багабойны, паўстрымлівы,
9 які трымаецца вернага слова згодна з вучэньнем, каб мог і настаўляць у здаровым вучэньні,
і дакараць тых, якія працівяцца.
10 Бо ёсьць шмат і непакорлівых, і пустаслоўных, і ашуканцаў, асабліва з абрэзаных,
11 якім трэба закрываць вусны; яны цэлыя дамы руйнуюць, навучаючы, чаго ня сьлед, дзеля
агіднага набытку.
12 Сказаў нехта з іх, уласны іхні прарок: «Крыцяне заўсёды хлусяць, зьвяры ліхія, жываты
гультайскія».
13 Сьведчаньне гэтае праўдзівае. Дзеля гэтае прычыны дакарай іх сувора, каб былі здаровыя ў
веры,
14 не зважаючы на юдэйскія байкі і прыказаньні людзей, якія адварочваюцца ад праўды.
15 Для чыстых усё чыста, а для апаганеных і бязьверных няма нічога чыстага, але апаганены і
розум іхні, і сумленьне.
16 Яны кажуць, што ведаюць Бога, а ўчынкамі адракаюцца, [яны —] брыдотныя і непакорныя,
і на ўсякую добрую справу няздольныя.

Ціт 2

1 А ты гавары, як належыць здароваму вучэньню:
2 каб старыя былі пільныя, сумленныя, цьвярозыя, здаровыя ў веры, любові, цярплівасьці;
3 каб старыя жанчыны паводзілі сябе, як належыцца сьвятым, не паклёпнічалі, не пілі шмат
віна, вучылі добраму,
4 каб вучылі мудрасьці маладых, каб тыя любілі мужоў, любілі дзяцей,
5 былі цьвярозыя, чыстыя, гаспадарлівыя, добрыя, падпарадкаваныя сваім мужам, каб не было
блюзьненьня на слова Божае.
6 Маладых людзей таксама ўпрошвай думаць цьвяроза,
7 у-ва ўсім даючы сябе за прыклад добрых учынкаў, у навучаньні — чысьціню, сумленнасьць,
непахібнасьць,
8 слова здаровае, ненаганнае, каб той, хто супрацівіцца, быў асаромлены, ня маючы нічога
благога сказаць пра нас.
9 Слугаў [навучай] падпарадкоўвацца сваім уладарам, у-ва ўсім падабацца ім, не пярэчачы,
10 не прыхоўваючы сабе, але зьяўляючы ўсю добрую вернасьць, каб у-ва ўсім аздаблялі
вучэньне Збаўцы нашага Бога.
11 Бо зьявілася ласка Божая, што дае збаўленьне для ўсіх людзей,

12 якая навучае нас, каб, адрокшыся ад бязбожнасьці і пажадлівасьцяў сьвету, цьвяроза,
праведна і пабожна жылі мы ў цяперашнім веку,
13 чакаючы шчасьлівае надзеі і зьяўленьня славы вялікага Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста,
14 Які даў Сябе за нас, каб выбавіць нас ад усякага беззаконьня і ачысьціць Сабе народ асаблівы,
які рупіцца пра добрыя справы.
15 Гэтае кажы, упрошвай і дакарай з усякім загадам; няхай ніхто табою не пагарджае.

Ціт 3

1 Нагадвай ім, каб падпарадкоўваліся і слухаліся начальнікаў і ўлады, былі падрыхтаваныя на
ўсякую добрую справу,
2 на нікога ня блюзьнілі, не былі ваяўнічымі, былі спагаднымі і зьяўлялі ўсякую ціхасьць
адносна ўсіх людзей.
3 Бо і мы былі некалі бяздумнымі, непакорнымі, падманутымі, служачы пажаданьням і
розным асалодам, жывучы ў ліхоце і зайздрасьці, былі паскуднымі, ненавідзячы адзін аднаго.
4 А калі зьявілася ласкавасьць і любоў да людзей Збаўцы нашага, Бога,
5 Ён збавіў нас ня дзеля ўчынкаў праведнасьці, якія мы ўчынілі, але паводле літасьці Сваёй,
праз лазьню адраджэньня і абнаўленьня Духам Сьвятым,
6 Якога Ён выліў на нас шчодра праз Ісуса Хрыста, Збаўцу нашага,
7 каб, апраўдаўшыся ласкай Ягонай, мы сталіся праз надзею спадкаемцамі жыцьця вечнага.
8 Вернае слова; і я хачу, каб ты сьцьвярджаў гэта, каб тыя, што вераць Богу, былі старанныя ў
выкананьні добрых справаў: гэта добра і людзям карысна.
9 А дурных спрэчак, і радаводаў, і сварак, і звадак адносна Закону пазьбягай, бо яны
некарысныя і марныя.
10 Чалавека герэтыка пасьля першага і другога напамінаньня пакінь,
11 ведаючы, што гэтакі разбэсьціўся і грашыць, асудзіўшы самога сябе.
12 Калі пашлю да цябе Арцёма або Тыхіка, намагайся прыйсьці да мяне ў Нікапаль, бо я
пастанавіў перазімаваць там.
13 Зэна законьніка і Апалёса старанна правядзі, каб у іх не было ні ў чым недахопу.
14 Няхай і нашыя вучацца выконваць добрыя справы ў пільных патрэбах, каб не былі
бясплодныя.
15 Вітаюць цябе ўсе, што са мною. Прывітай тых, што сябруюць з намі ў веры. Ласка з усімі
вамі. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ФІЛІМОНА АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, вязень Ісуса Хрыста, і Цімафей, брат, — Філімону, улюбёнаму і супрацоўніку нашаму,
2 і ўлюбёнай Апфіі, і Архіпу, таварышу нашаму ў барацьбе, і хатняй царкве тваёй:
3 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста.
4 Дзякую Богу майму, заўсёды ўзгадваючы пра цябе ў малітвах маіх,
5 чуючы пра любоў тваю і веру, якую маеш да Госпада Ісуса і да ўсіх сьвятых,
6 каб супольнасьць веры тваёй была дзейснай у пазнаньні ўсякага дабра, якое ў вас у Хрысьце Ісусе.
7 Бо вялікую маем ласку і пацяшэньне ў любові тваёй, бо праз цябе, браце, супачылі ўнутранасьці сьвятых.
8 Дзеля гэтага, маючы вялікую ў Хрысьце адвагу загадваць табе, што прыстойна [рабіць],
9 лепш праз любоў прашу я, ня хто іншы, як Павал, староста, а цяпер і вязень Ісуса Хрыста.
10 Прашу цябе адносна дзіцяці майго Анісіма, якога я нарадзіў у путах маіх,
11 што быў некалі некарысны для цябе, а цяпер патрэбны табе і мне.
12 Яго я паслаў, а ты яго, як мае ўнутранасьці, прыймі.
13 Хацеў я яго пры сабе трымаць, каб ён замест цябе паслужыў мне ў путах за Эвангельле,
14 але без твае згоды нічога не хацеў зрабіць, каб дабро тваё не з прынукі было, а з добрае волі.
15 Бо можа ён дзеля таго на гадзіну адыйшоў, каб ты атрымаў яго назаўсёды,
16 ужо не як слугу, але вышэй за слугу, як брата ўлюбёнага, асабліва для мяне, а тым больш для цябе — і паводле цела, і ў Госпадзе.
17 Дык калі маеш мяне за супольніка, прыймі яго, як мяне.
18 А калі ён чым скрыўдзіў цябе або вінен, лічы гэтае на мне.
19 Я, Павал, напісаў маёю рукою: «Я аддам»; каб не казаць табе, што ты і самім сабою мне вінны.
20 Гэтак, браце, дай мне скарыстацца ад цябе ў Госпадзе; супакой унутранасьці мае ў Госпадзе.
21 Перакананы ў паслухмянасьці тваёй, я напісаў да цябе, ведаючы, што ты зробіш і больш, чым кажу.
22 А таксама падрыхтуй для мяне гасподу, бо спадзяюся, што праз малітвы вашыя буду вам падараваны.
23 Вітае цябе Эпафрас, вязень разам са мною ў Хрысьце Ісусе,
24 Марк, Арыстарх, Дэмас, Лука, супрацоўнікі мае.
25 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з духам вашым. Амэн.

ПАСЛАНЬНЕ ДА ГЕБРАЯЎ АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Бог, Які шмат разоў і шматлікімі спосабамі здаўна гаварыў да бацькоў праз прарокаў,
2 у апошнія гэтыя дні прамовіў да нас праз Сына, Якога паставіў за спадкаемцу ўсяго, праз
Якога і вякі ўчыніў.
3 Ён, будучы зьзяньнем славы і выразам існасьці Ягонай і ўсё словам моцы Сваёй трымаючы,
учыніўшы праз Сябе ачышчэньне грахоў нашых, сеў праваруч велічы на вышынях,
4 стаўшыся лепшым за анёлаў нагэтулькі, наколькі слаўнейшае за іх успадкаеміў імя.
5 Бо каму з анёлаў сказаў Ён калі: «Ты — Сын Мой, Я сёньня нарадзіў Цябе»? І яшчэ: «Я буду
Яму Айцом, і Ён будзе Мне Сынам»?
6 А калі ізноў уводзіць Першароднага ў сусьвет, кажа: «І няхай паклоняцца Яму ўсе анёлы
Божыя».
7 А наконт анёлаў кажа: «Ён робіць анёламі Сваімі духаў і служыцелямі Сваімі — полымя
агню».
8 А наконт Сына: «Пасад Твой, Божа, на век вечны; кій правасьці — кій валадарства Твайго.
9 Ты палюбіў праведнасьць і зьненавідзеў беззаконьне. Дзеля гэтага памазаў Цябе, Божа, Бог
Твой алеем весялосьці больш за таварышаў Тваіх».
10 І: «Ты напачатку, Госпадзе, умацаваў зямлю, і неба — справа рук Тваіх;
11 яны загінуць, а Ты застаешся; і ўсе, як шаты, састарэюць,
12 і, як адзеньне, Ты скруціш іх, і яны зьменяцца; а Ты — Той Самы, і гады Твае ня скончацца».
13 А наконт каго з анёлаў сказаў Ён калі: «Сядзь праваруч Мяне, пакуль пакладу ворагаў Тваіх
як падножжа ног Тваіх»?
14 Ці ня ўсе яны — паслугавальныя духі, якія пасланыя на служэньне дзеля тых, якія маюць
успадкаеміць збаўленьне?

Гебр 2

1 Дзеля гэтага мусім асабліва зважаць на чутае, каб нас ня зьнесла [плыньню].
2 Бо калі сказанае праз анёлаў слова было цьвёрдае, і ўсякае парушэньне і непаслухмянасьць
даставалі справядлівую адплату,
3 як мы ўцячэм, калі занядбалі такое вялікае збаўленьне, якое спачатку было сказанае
Госпадам, зацьверджана ў нас ад тых, якія чулі,
4 якім засьведчыў Бог праз знакі, і цуды, і розныя сілы, і праз раздаваньне Духа Сьвятога
паводле волі Яго?
5 Бо не анёлам падпарадкаваў Ён будучы сусьвет, пра які гаворым.
6 Засьведчыў жа нехта недзе, кажучы: «Што ёсьць чалавек, што Ты ўзгадваеш яго, або сын
чалавечы, што Ты адведваеш яго?
7 Крыху Ты панізіў яго перад анёламі, даў яму вянок славы і пашаны і паставіў яго па-над
творамі рук Тваіх;
8 усё падпарадкаваў Ты пад ногі яго». Бо калі падпарадкаваў яму ўсё, нічога не пакінуў
непакорным яму. Але цяпер мы яшчэ ня бачым, каб усё было падпарадкавана яму,
9 а бачым Ісуса, Які крыху быў паніжаны перад анёламі, Які праз пакуту сьмерці атрымаў
вянок славы і пашаны, каб з ласкі Божае пакаштаваў сьмерці за ўсіх.
10 Бо трэба было, каб Той, дзеля Якога ўсё і праз Якога ўсё, ведучы многіх сыноў у славу,
Начальніка збаўленьня іхняга праз пакуты ўчыніў споўненым.
11 Бо і Той, Які асьвячае, і тыя, якія асьвячаюцца, усе — з Аднаго; дзеля гэтай прычыны Ён не
саромеецца называць іх братамі, кажучы:
12 «Паведамлю імя Тваё братам Маім, пасярод царквы засьпяваю Табе».
13 І яшчэ: «Я буду спадзявацца на Яго». І яшчэ: «Вось, я і дзеці, якіх даў мне Бог».

14 Дык калі дзеці сталіся супольнікамі цела і крыві, і Ён таксама мае ўдзел у іх, каб праз сьмерць
зьнішчыць таго, хто мае ўладу над сьмерцю, гэта ёсьць д'ябла,
15 і вызваліць тых, якія дзеля страху сьмерці праз усё жыцьцё падлягалі няволі.
16 Бо, сапраўды, не анёлаў Ён прыймае, але насеньне Абрагама прыймае.
17 Дзеля гэтага Ён павінен быў у-ва ўсім стацца падобным да братоў, каб быць міласьцівым і
верным Першасьвятаром перад Богам дзеля перамольваньня за грахі народу.
18 Бо таму, што Сам Ён, спакушаны, цярпеў, можа тым, якія спакушаныя, дапамагчы.

Гебр 3

1 Дзеля гэтага, браты сьвятыя, удзельнікі ў нябесным пакліканьні, прыгледзьцеся да Апостала
і Першасьвятара вызнаньня нашага, Ісуса Хрыста,
2 Які верны Таму, Які паставіў Яго, як і Майсей у-ва ўсім доме Ягоным.
3 Бо Ён варты яшчэ большае славы за Майсея, як і большую пашану мае за дом той, хто яго
збудаваў.
4 Бо ўсякі дом некім будуецца; а Той, Які ўсё збудаваў, — Бог .
5 І Майсей верны ў-ва ўсім доме Ягоным, як слуга, дзеля сьведчаньня пра тое, што мела быць
сказаным;
6 а Хрыстос — як Сын у доме Ягоным, дом Якога — мы, калі толькі адвагу і пахвалу надзеі
цьвёрда да канца трымаць будзем.
7 Дзеля гэтага, як кажа Дух Сьвяты: «Сёньня, калі пачуеце голас Ягоны,
8 не закамяняйце сэрцы вашыя, як у раздражненьні, у дзень спакусы ў пустыні,
9 дзе спакушалі Мяне бацькі вашыя, выпрабоўвалі Мяне і бачылі справы Мае сорак гадоў.
10 Дзеля гэтага ўгнявіўся Я на пакаленьне тое і сказаў: "Заўсёды блукаюць яны сэрцам, а самі
не спазналі шляхоў Маіх".
11 Дык прысягнуў Я ў гневе Маім, што ня ўвойдуць яны ў супачынак Мой».
12 Глядзіце, браты, каб не было ў кім з вас сэрца злога і бязьвернага, што адступаецца ад Бога
Жывога,
13 але прасіце адзін аднаго штодня, пакуль называецца "сёньня", каб хто з вас не закамянеў
праз падман грэху.
14 Бо мы сталіся ўдзельнікамі Хрыста, калі толькі пачатку пэўнасьці цьвёрда будзем трымацца
да канца,
15 пакуль гаворыцца: «Сёньня, калі пачуеце голас Ягоны, не закамяняйце сэрцы вашыя, як у
раздражненьні».
16 Бо некаторыя, што чулі, раздражніліся; але ня ўсе, якія выйшлі з Эгіпту праз Майсея.
17 На каго ж гневаўся Ён сорак гадоў? Ці не на тых, якія зграшылі, косткі якіх палеглі ў пустыні?
18 А каму прысягаў Ён, што ня ўвойдуць яны ў супачынак Ягоны, калі ня тым, якія не
скарыліся?
19 І бачым, што яны не змаглі ўвайсьці праз недаверства.

Гебр 4

1 Дык будзем баяцца, каб, калі яшчэ трывае абяцаньне ўвайсьці ў супачынак Ягоны, ня думаў
хто з вас, што ён горшы.
2 Бо і нам [гэта] дабравешчана, як і тым; але ім не дало карысьці пачутае слова, бо не
спалучылася з вераю тых, якія слухалі.
3 Бо ўваходзім у супачынак мы, якія паверылі, бо Ён сказаў: «Дык прысягнуў Я ў гневе Маім,
што ня ўвойдуць яны ў супачынак Мой», хоць справы [Ягоныя] сталіся ад заснаваньня сьвету.
4 Бо сказана недзе наконт сёмага дню гэтак: «І супачыў Бог у дзень сёмы ад усіх справаў Сваіх».
5 І яшчэ тут: «Ня ўвойдуць яны ў супачынак Мой».
6 Дык, калі некаторым застаецца ўвайсьці ў яго, а тыя, якім раней дабравешчана, не ўвайшлі
ў яго за няскоранасьць,

7 ізноў Ён вызначае дзень “сёньня”, кажучы праз Давіда, праз гэтулькі часу, як было сказана:
«Сёньня, калі пачуеце голас Ягоны, не закамяняйце сэрцы вашыя».
8 Бо калі б Егошуа даў тым супачынак, не было б сказана пасьля таго пра іншы дзень.
9 Таму застаецца для народу Божага захаваньне суботы.
10 Бо хто ўвайшоў у супачынак Ягоны, той і сам супачыў ад справаў сваіх, як і Бог ад Сваіх.
11 Дык будзем намагацца ўвайсьці ў супачынак гэты, каб хто за тым прыкладам не палёг праз
няскоранасьць.
12 Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і працінае аж да
разьдзяленьня душы і духа, суставаў і шпіку, і судзіць думкі і намеры сэрца.
13 І няма стварэньня, схаванага перад Ім, але ўсё аголена і адкрыта перад вачыма Таго, пра
Якога нашае слова.
14 Дык, маючы Першасьвятара вялікага, Які прайшоў праз неба, Ісуса, Сына Божага, будзем
трымацца вызнаньня.
15 Бо маем Першасьвятара не такога, што ня можа спачуваць слабасьцям нашым, але такога,
які, падобна нам, дазнаў спакушэньня ў-ва ўсім, апрача грэху.
16 Дык будзем набліжацца з адвагаю да пасаду ласкі, каб атрымаць літасьць і знайсьці ласку
дапамогі ў адпаведны час.

Гебр 5

1 Бо ўсякі першасьвятар, які спаміж людзей бярэцца, дзеля людзей стаўляецца на тое, што
Божае, каб прыносіў дары і ахвяры за грахі,
2 каб мог спачуваць тым, якія не разумеюць і заблукалі, бо і сам абложаны нядужасьцю,
3 і праз гэта павінен як за народ, гэтак і за сябе прыносіць [ахвяры] за грахі.
4 І ніхто сам сабою не прыймае гэтую пашану, але той, хто пакліканы Богам, як і Аарон.
5 Гэтак і Хрыстос ня Сам Сябе праславіў, каб быць Першасьвятаром, але Той, Які сказаў Яму:
«Ты — Сын Мой, Я сёньня нарадзіў Цябе»,
6 а таксама ў іншым [месцы] кажа: «Ты — сьвятар на вякі паводле парадку Мэльхісэдэка».
7 Ён у дні цела Свайго з вялікім крыкам і сьлязьмі прыносіў просьбы і ўпрошваньні да Таго, Які
мог збавіць Яго ад сьмерці, і быў выслуханы дзеля багабойнасьці.
8 Хоць Ён — Сын, але навучыўся паслухмянасьці праз тое, што перацярпеў,
9 і, споўніўшы [ўсё], стаўся для ўсіх, якія паслухмяныя Яму, прычынаю вечнага збаўленьня,
10 названы ад Бога Першасьвятаром паводле парадку Мэльхісэдэка.
11 Адносна Яго мы маем шмат сказаць, і цяжка выказаць, бо вы сталіся маруднымі, каб
слухаць.
12 Бо вы, якія паводле часу павінны быць настаўнікамі, ізноў маеце патрэбу, каб вучылі вас
падставовым пачаткам словаў Божых, і вы маеце патрэбу ў малацэ, а ня ў цьвёрдай страве.
13 Бо ўсякі, хто спажывае малако, неспрактыкаваны ў слове праведнасьці, бо ён — немаўля.
14 А цьвёрдая страва ёсьць для дасканалых, у якіх праз ужываньне разуменьне спрактыкаванае
распазнаваць добрае і ліхое.

Гебр 6

1 Дзеля гэтага, пакінуўшы пачатак Хрыстовага слова, зьвернемся да дасканаласьці, не кладучы
ізноў падмуркі, [гаворачы пра] навяртаньне ад мёртвых справаў і веру ў Бога,
2 вучэньне пра хрышчэньні, і ўскладаньне рук, і ўваскрасеньне мёртвых, і суд вечны.
3 І гэта зробім, калі Бог дазволіць.
4 Бо немагчыма тых, якія аднойчы былі прасьветленыя, і пакаштавалі дару нябеснага, і сталіся
ўдзельнікамі Духа Сьвятога,
5 і пакаштавалі добрага слова Божага і моцаў будучага веку,
6 і адпалі, ізноў абнаўляць праз навяртаньне, тых, якія ізноў укрыжоўваюць у сабе Сына Божага
і выстаўляюць на сорам [Яго].

7 Бо зямля, якая п’е дождж, што часта зыходзіць на яе, і родзіць расьліну, карысную для тых,
хто абрабляе яе, атрымлівае дабраслаўленьне ад Бога;
8 а тая, якая прыносіць церні і асот, непрыдатная і блізкая да праклёну, і канец яе — спаленьне.
9 А мы перакананыя адносна вас, улюбёныя, што вы — лепшыя і маеце збаўленьне, хаця і
гаворым гэтак.
10 Бо Бог не няправедны, каб забыцца на справу вашую і працу любові, якую вы зьявілі ў імя
Ягонае, калі служылі і служыце сьвятым.
11 А мы жадаем, каб кожны з вас выяўляў такую самую дбайнасьць у пэўнасьці надзеі да канца,
12 каб ня стацца вам маруднымі, але пераймальнікамі тых, якія праз веру і доўгацярплівасьць
бяруць у спадчыну абяцаньні.
13 Бо Бог, абяцаючы Абрагаму, ня маючы нікога вышэйшага, каб прысягаць, прысягаў Самім
Сабою,
14 кажучы: «Праўдзіва, дабраслаўляючы, дабраслаўлю цябе і, памнажаючы, памножу цябе».
15 І гэтак [Абрагам], маючы доўгацярплівасьць, атрымаў абяцаньне.
16 Бо людзі прысягаюць вышэйшым, і ўсякая спрэчка між імі завяршаецца прысягай на
сцьвярджэньне.
17 Дзеля гэтага Бог, хочучы празьмерна паказаць спадкаемцам абяцаньня нязьменнасьць
намеру Свайго, ужыў прысягу,
18 каб праз дзьве нязьменныя рэчы, у якіх Богу хлусіць немагчыма, вялікае пацяшэньне мелі
мы, якія прыбеглі ўхапіцца за надзею, што перад намі ляжыць,
19 якую маем, як якар душы, пэўны і трывалы, які ўваходзіць ва ўнутранае за заслону,
20 куды за нас як папярэднік увайшоў Ісус, стаўшыся Першасьвятаром на вякі паводле парадку
Мэльхісэдэка.

Гебр 7

1 Бо гэты Мэльхісэдэк, валадар Салему, сьвятар Бога Найвышэйшага, які сустрэў Абрагама,
калі той вяртаўся пасьля разгрому валадароў, і дабраславіў яго,
2 і якому дзесяціну ад усяго аддзяліў Абрагам, па-першае, перакладаецца як Валадар
праведнасьці, а пасьля ён — валадар Салему, гэта ёсьць Валадар супакою,
3 бяз бацькі, бяз маці, без радаводу, які ня мае ані пачатку дзён, ані канца жыцьця, падобны да
Сына Божага, застаецца сьвятаром назаўсёды.
4 Бачыце, які вялікі той, якому нават Абрагам патрыярх даў дзесяціну са здабычы.
5 Тыя з сыноў Левія, якія атрымліваюць сьвятарства, маюць прыказаньне паводле Закону
браць дзесяціну з народу, гэта ёсьць з братоў сваіх, хаця і яны выйшлі з паясьніцы Абрагама.
6 А ён, які не паходзіць з іх, узяў дзесяціну ад Абрагама і дабраславіў таго, які меў абяцаньні.
7 Без усялякае спрэчкі меншы дабраслаўляецца большым.
8 І тут дзесяціны атрымліваюць людзі сьмяротныя, а там — той, пра якога сьведчыцца, што
жыве.
9 І, можна так сказаць, праз Абрагама ўзята дзесяціна і з Левія, які сам атрымлівае дзесяціны,
10 бо ён быў яшчэ ў паясьніцы бацькі, калі сустрэў яго Мэльхісэдэк.
11 Дык, калі б усё зьдзейсьнілася праз сьвятарства лявітаў, бо народ разам з ім атрымаў Закон,
якая яшчэ [была б] патрэба паўставаць іншаму сьвятарству паводле парадку Мэльхісэдэка, і
не паводле парадку Аарона называцца?
12 Бо разам з пераменай сьвятарства патрэбна, каб сталася і зьмена Закону.
13 Бо Той, пра Якога гаворыцца гэтае, належаў да другога калена, з якога ніхто не прыступаў
да ахвярніка.
14 Бо відочна, што Госпад наш узыйшоў з калена Юды, а пра гэтае калена Майсей нічога не
сказаў адносна сьвятарства.
15 І гэта яшчэ больш зразумела, калі паводле падабенства Мэльхісэдэка паўстае іншы Сьвятар,
16 Які не паводле Закону прыказаньня цялеснага стаўся, але паводле моцы незьнішчальнага
жыцьця.
17 Бо засьведчыў [Бог]: «Ты — сьвятар на вякі паводле парадку Мэльхісэдэка».

18 Бо раней быўшае прыказаньне адкінута праз слабасьць яго і некарыснасьць,
19 бо Закон нічога ня споўніў, але ўводзіцца лепшая надзея, праз якую мы набліжаемся да Бога.
20 І як усё [гэта было] не без прысягі,
21 бо тыя ставаліся сьвятарамі без прысягі, а Гэты — з прысягай Таго, Які гаварыў пра Яго: «Прысягнуў Госпад і не раскаецца: Ты — сьвятар на вякі паводле парадку Мэльхісэдэка»,
22 нагэтулькі лепшага запавету Паручальнікам стаўся Ісус.
23 І тых сьвятароў было шмат дзеля таго, што сьмерць забараняла [некаму] затрымацца,
24 а Гэты праз тое, што застаецца на вякі, мае сьвятарства, якое не адступаецца [ад Яго],
25 таму Ён і можа цалкам збаўляць тых, якія прыходзяць праз Яго да Бога, заўсёды жывы, каб заступацца за іх.
26 Бо Гэткага трэба нам Першасьвятара, сьвятога, нявіннага, беззаганнага, адлучанага ад грэшнікаў і ўзвышанага па-над нябёсы,
27 Які ня мае патрэбы штодня, як тыя першасьвятары, прыносіць ахвяры спачатку за свае грахі, пасьля за [грахі] народу, бо Ён зрабіў гэта аднойчы, прынёсшы [ў ахвяру] Сябе.
28 Бо Закон стаўляе за першасьвятароў людзей, якія маюць нядужасьць, а слова прысягі, што пасьля Закону, [паставіла] Сына, дасканалага на вякі.

Гебр 8

1 А галоўнае ў тым, што сказана, тое, што мы маем Першасьвятара, Які сеў праваруч пасаду велічы ў небе,
2 [і ёсьць] служыцель Сьвятыні і праўдзівага Намёту, пастаўленага Госпадам, а не чалавекам.
3 Бо кожны першасьвятар стаўляецца на тое, каб прыносіць дары і ахвяры; таму трэба, каб і Гэты меў нешта, што прынесьці.
4 Бо калі б Ён быў на зямлі, ня быў бы сьвятаром, [бо] ёсьць сьвятары, якія паводле Закону прыносяць дары,
5 якія служаць прыкладу і ценю [рэчаў] нябесных, як атрымаў слова Майсей, калі меўся зрабіць намёт: «Глядзі, — прамовіў Ён, — зрабі ўсё паводле ўзору, які паказаны табе на гары».
6 А цяпер Ён атрымаў служэньне тым слаўнейшае, чым лепшага Ён пасярэднік запавету, які ўзаконены на лепшых абяцаньнях.
7 Бо калі б той першы быў без заганы, не шукалася б месца для другога.
8 Бо, вінавацячы іх, кажа: «Вось, надыходзяць дні, — кажа Госпад, — і Я зраблю з домам Ізраіля і з домам Юды новы запавет,
9 не паводле запавету, які Я зрабіў з бацькамі іх у дзень, калі ўзяў іх рукою Маёю, каб вывесьці іх з зямлі Эгіпту, бо яны ня вытрывалі ў запавеце Маім, і Я занядбаў іх, — кажа Госпад.
10 Вось запавет, які Я заключу з домам Ізраіля пасьля тых дзён, — кажа Госпад, — даючы законы Мае ў думкі іхнія, напішу іх і на сэрцах іхніх, і буду ім Богам, а яны Мне будуць народам.
11 І ня будзе вучыць кожны бліжняга свайго і кожны брата свайго, кажучы: “Пазнай Госпада”, бо ўсе, ад малога іхняга да вялікага іхняга, будуць ведаць Мяне.
12 Бо міласьцівы буду да няправеднасьцяў іхніх, і грахоў іхніх і беззаконьняў іхніх больш не ўзгадаю».
13 Калі кажа “новы”, учыніў старым першы; а тое, што старэе і здаўніваецца, блізкае, каб шчэзнуць.

Гебр 9

1 Дык і першы [запавет] меў пастановы служэньня і сьвятыню ў сьвеце.
2 Бо першы намёт быў збудаваны, і ў ім сьвечнік, і стол, і хлябы пакладныя, і завецца ён “Сьвятое”.
3 А за другой заслонай намёт, які завецца “Сьвятое Сьвятых”,
4 які мае залатую кадзільню і каўчэг запавету, які абкладзены з усіх бакоў золатам, у якім залатая пасудзіна з маннай, і кій Аарона, што расквітнеў, ітабліцы запавету,

5 а над ім — херувімы славы, якія ацяняюць перамольню; пра гэта ня варта цяпер казаць падрабязна.
6 А калі гэта так збудавана, у першы намёт заўсёды ўваходзяць сьвятары, зьдзяйсьняючы служэньне,
7 а ў другі — раз у год адзін першасьвятар, не без крыві, якую прыносіць за сябе і за няведаньне народу.
8 Гэтым паказвае Дух Сьвяты, што яшчэ не адкрыты шлях у сьвятыню, пакуль стаіць першы намёт,
9 які ёсьць прыклад цяперашняга часу, калі прыносяцца дары і ахвяры, якія ня могуць удасканаліць паводле сумленьня таго, хто служыць,
10 якія толькі ў ежы і пітве, і розных абмываньнях і пастановах цела, якія пастаўленыя да часу выпраўленьня.
11 А Хрыстос, Першасьвятар будучага дабра, прыйшоўшы праз вялікшы і дасканалейшы намёт, не рукамі зроблены, гэта значыць, не такога стварэньня,
12 і не праз кроў казлоў і цялят, але праз уласную кроў, адзін раз увайшоў у сьвятыню, знайшоўшы вечнае выбаўленьне.
13 Бо калі кроў валоў і казлоў і попел каровы, пакрапіўшы апаганеных, асьвячае іх дзеля чыстасьці цела,
14 наколькі больш кроў Хрыста, Які праз Духа вечнага прынёс Сябе беззаганнага Богу, ачысьціць сумленьне вашае ад мёртвых справаў дзеля служэньня Богу Жывому?
15 І дзеля гэтага Ён — Пасярэднік новага запавету, каб, як станецца сьмерць дзеля адкупленьня парушэньняў, [што былі пры] першым запавеце, тыя, якія пакліканыя да вечнае спадчыны, атрымалі абяцаньне.
16 Бо дзе запавет, трэба, каб прыйшла сьмерць таго, хто заключыў [яго],
17 бо запавет набывае моц ад памёршых; ён ня мае сілы, пакуль жыве той, хто заключыў [яго].
18 Дык і першы [запавет] быў усталяваны не без крыві.
19 Бо Майсей, сказаўшы ўсе прыказаньні паводле Закону ўсяму народу, узяў кроў цялят і казлоў з вадою, і воўнай пунсовай, і ізопам, пакрапіў і саму кнігу, і ўвесь народ,
20 кажучы: «Гэта кроў запавету, які даў вам Бог».
21 І намёт, і ўсё начыньне дзеля служэньня таксама пакрапіў крывёю.
22 І амаль усё паводле Закону ачышчаецца крывёю, і без праліцьця крыві не бывае адпушчэньня.
23 Дык трэба было, каб [рэчы, што паводле] прыкладу таго, што ў небе, ачышчаліся гэтымі, а самі [рэчы] нябесныя — лепшымі за гэтыя ахвярамі.
24 Бо Хрыстос увайшоў не ў сьвятыню, рукамі зробленую, на ўзор праўдзівае, але ў самае неба, каб цяпер зьявіцца перад абліччам Божым за нас;
25 і не дзеля таго, каб шматкроць прыносіць Сябе, як штогод уваходзіць першасьвятар у сьвятыню з чужою крывёй,
26 бо мусіў бы Ён шматкроць цярпець ад заснаваньня сьвету, але Ён цяпер адзін раз зьявіўся на сканчэньні вякоў дзеля адкіданьня грэху праз ахвяру Сваю.
27 І як усім людзям вызначана раз памерці, а пасьля гэтага — суд,
28 гэтак і Хрыстос, раз прынёсшы Сябе [ў ахвяру], каб панесьці грахі многіх, другі раз бяз грэху будзе зьяўлены дзеля збаўленьня тым, якія чакаюць Яго.

Гебр 10

1 Бо Закон, які мае цень будучага дабра, а ня сам вобраз рэчаў, тымі ахвярамі, якія нязьменна прыносяцца штогод, ніколі ня можа зрабіць дасканалымі тых, што прыходзяць [з імі].
2 Бо іначай перасталі б прыносіць іх, бо ўжо ня мелі б сьвядомасьці грахоў тыя, што служаць, аднойчы ачышчаныя.
3 Але праз гэтыя [ахвяры] штогод узгадваецца пра грахі,
4 бо немагчыма, каб кроў валоў і казлоў забірала грахі.

5 Дзеля гэтага [Хрыстос], уваходзячы ў сьвет, кажа: «Ахвяры і дару Ты не захацеў, але цела
падрыхтаваў для Мяне.
6 Цэласпаленьні і [ахвяры] за грэх Ты не ўпадабаў.
7 Тады Я сказаў: “Вось, іду (на пачатку кнігі напісана пра Мяне) учыніць, Божа, волю Тваю”».
8 Сказаўшы перш, што «ахвяры, і дару, і цэласпаленьняў, і [ахвяры] за грэх Ты не захацеў і не
ўпадабаў», а яны прыносяцца паводле Закону,
9 пасьля сказаў: «Вось, іду ўчыніць, Божа, волю Тваю». Касуе першае, каб паставіць другое.
10 Гэтай воляй мы асьвячоныя праз аднакротнае прынясеньне цела Ісуса Хрыста.
11 І ўсякі сьвятар штодня стаіць, спраўляючы служэньне і шматкроць прыносячы тыя самыя
ахвяры, якія ніколі ня могуць зьняць грахоў.
12 А Ён, прынёсшы адну ахвяру за грахі, назаўсёды сеў праваруч Бога,
13 чакаючы яшчэ, пакуль ворагі Ягоныя будуць пакладзены як падножжа ног Ягоных.
14 Бо Ён адным дарам назаўсёды зрабіў дасканалымі тых, якіх асьвяціў.
15 Сьведчыць жа нам і Дух Сьвяты, бо пасьля прадказана:
16 «Вось запавет, які Я заключу з імі пасьля дзён тых, — кажа Госпад, — даючы законы Мае ў
сэрцы іхнія, напішу іх і ў думках іхніх,
17 і грахоў іхніх і беззаконьняў іхніх больш не ўзгадаю».
18 А дзе адпушчэньне грахоў, ужо непатрэбны дар за іх.
19 Дык, браты, маючы адвагу ўваходзіць у сьвятыню праз кроў Ісуса Хрыста,
20 шляхам новым і жывым, які Ён усталяваў для нас праз заслону, гэта ёсьць цела Сваё,
21 і маючы вялікага Сьвятара над домам Божым,
22 будзем падыходзіць са шчырым сэрцам, у поўні веры, пакрапіўшы сэрцы, [каб ачысьціць]
ад сумленьня злога, і абмыўшы цела чыстай вадою.
23 Будзем трымацца няўхільна вызнаньня надзеі, бо верны Той, Які абяцаў,
24 і будзем зважаць адзін на аднаго, заахвочваючы да любові і добрых учынкаў,
25 не пакідаючы зграмаджэньня свайго, як ёсьць у некаторых звычай, але заклікаючы [ў яго],
і тым больш, калі бачыце, што набліжаецца дзень той.
26 Бо калі мы самахоць грашым, атрымаўшы пазнаньне праўды, ужо не застаецца ахвяра за
грахі,
27 але нейкае жахлівае чаканьне суду і жару агню, які мае пажэрці супраціўнікаў.
28 Хто адкінуў Закон Майсея пры двух ці трох сьведках, бяз літасьці памірае.
29 Наколькі, думаеце, цяжэйшае кары варты той, хто Сына Божага патаптаў, і кроў запавету,
якою ён асьвячоны, за звычайную палічыў, і Духа ласкі зьняважыў?
30 Бо мы ведаем Таго, Які сказаў: «“Мне помста, Я аддам”, — кажа Госпад». І ізноў: «Госпад
будзе судзіць народ Свой».
31 Жахліва трапіць у рукі Бога Жывога!
32 Узгадайце ж ранейшыя дні вашыя, калі вы, прасьветленыя, вытрывалі вялікае змаганьне
пакутаў,
33 ці то самі выстаўляныя на зьнявагі і зьдзекі, ці то стаўшыся супольнікамі тых, якія
пераносяць такое.
34 Бо вы і маім путам спачувалі, і рабунак маёмасьці вашае з радасьцю прыймалі, ведаючы,
што маеце для сябе ў небе маёмасьць лепшую, якая застанецца.
35 Дык не пакідайце адвагі вашае, якая мае вялікую нагароду.
36 Бо вам патрэбная цярплівасьць, каб, учыніўшы волю Божую, атрымаць абяцаньне.
37 Бо яшчэ крыху, зусім крыху, і надыйдзе Той, Які надыходзіць, і не замарудзіць.
38 «А праведны з веры жыць будзе»; і: «Калі хто будзе хістацца, не ўпадабае яго душа Мая».
39 Мы ж ня хісткія на загубу, але [стаім] у веры на здабыцьцё душы.

Гебр 11

1 А вера ёсьць пэўнасьць у тым, чаго спадзяемся, перакананасьць у рэчах нябачных.

2 Бо ў ёй засьведчаны старэйшыя [нашыя].
3 Вераю разумеем, што вякі наладжаны словам Божым, каб з няяўнага сталася бачнае.
4 Вераю Абэль прынёс Богу лепшую ахвяру, чым Каін, праз што атрымаў сьведчаньне, што ён — праведны, [бо гэта] засьведчыў Бог пра дары ягоныя; і праз яе ён, памёршы, яшчэ гаворыць.
5 Вераю Энох быў перанесены, што ня ўбачыў сьмерці; і не знайшлі яго, бо перанёс яго Бог. Бо перад перанясеньнем ягоным было засьведчана, што ён спадабаўся Богу.
6 А бяз веры спадабацца [Богу] немагчыма, бо той, хто прыходзіць да Бога, мусіць верыць, што Ён ёсьць і тым, хто шукае Яго, нагароду дае.
7 Вераю Ной, атрымаўшы слова пра тое, што яшчэ не было бачным, у багабойнасьці пабудаваў каўчэг дзеля збаўленьня дому свайго; ёю ён асудзіў сьвет і паводле веры стаўся спадкаемцам праведнасьці.
8 Вераю Абрагам, калі быў пакліканы, падпарадкаваўся, каб ісьці ў месца, якое меў атрымаць у спадчыну, і выйшаў, не разумеючы, куды ідзе.
9 Вераю вандраваў ён на зямлі абяцанай, як на чужой, жывучы ў намётах з Ісаакам і Якубам, суспадчыньнікамі таго самага абяцаньня;
10 бо ён чакаў гораду, які мае падмуркі, якога майстар і дойлід — Бог.
11 Вераю і сама Сара атрымала сілу на зачацьце насеньня і не па часе веку нарадзіла, бо верным прызнавала Таго, Які абяцаў.
12 І дзеля гэтага ад аднаго, і пры гэтым амярцьвелага, нарадзілася гэтак шмат, як зорак у небе і як незьлічоны пясок на ўзьбярэжжы мора.
13 Усе яны памерлі ў веры, не атрымаўшы абяцаньняў, але толькі здалёк бачачы іх, і маючы пэўнасьць, і вітаючы [іх], і прызнаючы, што яны — чужынцы і вандроўнікі на зямлі.
14 Бо тыя, што гэтак кажуць, паказваюць, што яны бацькаўшчыну шукаюць.
15 І, калі б яны памяталі тую, з якое выйшлі, мелі б час вярнуцца.
16 Але яны лепшага жадалі, гэта ёсьць нябеснага; дзеля гэтага Бог не саромеецца іх, каб іхнім Богам называцца, бо Ён падрыхтаваў ім горад.
17 Вераю Абрагам, спакушаны, прынёс [у ахвяру] Ісаака, і прынёс адзінароднага, якога прыняў як абяцаньне,
18 пра якога было сказана: «У Ісааку будзе названае насеньне табе»,
19 бо ён лічыў, што Бог мае моц і з мёртвых уваскрасіць, дзеля чаго і атрымаў яго як прыклад.
20 Вераю ў будучае Ісаак дабраславіў Якуба і Эзава.
21 Вераю Якуб, паміраючы, дабраславіў кожнага з сыноў Язэпа і пакланіўся на верх кія свайго.
22 Вераю Язэп, паміраючы, нагадаў пра выхад сыноў Ізраіля і загадаў наконт костак сваіх.
23 Вераю Майсей па нараджэньні тры месяцы быў хаваны бацькамі сваімі, бо яны бачылі, што хлопчык мілы [Богу], і не спалохаліся валадарскага загаду.
24 Вераю Майсей, стаўшыся дарослым, адмовіўся называцца сынам дачкі фараона
25 і выбраў лепш пакутаваць з народам Божым, чым мець часовую прыемнасьць грэху,
26 зьнявагу Хрыстовую палічыўшы большым багацьцем, чым скарбы эгіпецкія; бо ён на нагароду ўглядаўся.
27 Вераю пакінуў ён Эгіпет, не спалохаўшыся ярасьці валадарскай, бо непахісны быў, быццам бачачы Нябачнага.
28 Вераю ўчыніў ён Пасху і праліцьцё крыві, каб не крануў іх той, які нішчыў першародных.
29 Вераю перайшлі яны праз Чырвонае мора, як па сухому; на што спакусіўшыся, Эгіпцяне былі патопленыя.
30 Вераю ўпалі муры Ерыхону, як абыходзілі [іх] сем дзён.
31 Вераю Рахаў распусьніца, з супакоем прыняўшы выведчыкаў, не загінула з тымі, якія не скарыліся.
32 І што яшчэ скажу? Бо ня хопіць мне часу, каб распавядаць пра Гедэона, Барака, пра Самсона і Ефтая, пра Давіда і Самуэля, і пра прарокаў,
33 якія вераю перамагалі валадарствы, чынілі праведнасьць, атрымлівалі абяцаньні, загароджвалі пашчы ільвоў,

34 тушылі сілу агню, уцякалі ад вострыва мяча, умацоўваліся ад слабасьці, ставаліся дужымі ў
бітве, прымушалі ўцякаць табары чужынцаў,
35 жонкі атрымлівалі памёршых сваіх уваскрошанымі; а іншыя былі замучаныя, не
дачакаўшыся адкупленьня, каб атрымаць лепшае ўваскрашэньне,
36 іншыя паспыталі зьдзекаў і тартураў, а яшчэ путаў і вязьніцы,
37 былі каменаваныя, пілаваныя, спакушаныя, былі забіваныя мячом, бадзяліся ў авечых і
казіных скурах, маючы нястачу, прыгнёт, нягоды;
38 тыя, якіх сьвет ня быў варты, туляліся па пустынях і горах, па пячорах і шчылінах зямлі.
39 І ўсе яны, што засьведчаныя вераю, не атрымалі абяцаньня,
40 бо Бог прадугледзеў адносна нас нешта лепшае, каб яны не бяз нас асягнулі дасканаласьць.

Гебр 12

1 Дык і мы, маючы навокал нас гэткае воблака сьведкаў, адкінуўшы ўсякі цяжар і грэх, які нас
аблытвае, з цярплівасьцю будзем бегчы ў змаганьні, што ляжыць перад намі,
2 углядаючыся на Пачынальніка і Завяршальніка веры, Ісуса, Які замест радасьці, што была
перад Ім, вытрываў крыж, пагардзіўшы сорамам, і сеў праваруч пасаду Божага.
3 Бо паразважайце пра Таго, Які вытрываў гэтакую супраць Сябе варажнечу ад грэшнікаў, каб
вы не зьнемагаліся, саслабеўшы душамі вашымі.
4 Вы яшчэ не да крыві ваявалі, змагаючыся супраць грэху,
5 і забыліся пра пацяшэньне, якое зьвяртаецца да вас, як да сыноў: «Сыне мой! Ня грэбуй
настаўленьнем Госпадавым і не слабей, калі Ён цябе дакарае.
6 Бо каго любіць Госпад, таго карае, і бічуе ўсякага сына, якога прыймае».
7 Калі вы зносіце пакараньне, Бог ставіцца да вас, як да сыноў. Бо ці ёсьць гэтакі сын, якога не
карае бацька?
8 А калі вы без пакараньня, удзельнікамі якога сталіся ўсе, дык вы — байструкі, а не сыны.
9 Да таго, калі мы мелі бацькоў цела нашага, якія нас каралі, і саромеліся перад імі, ці ня шмат
больш маем падпарадкоўвацца Айцу духаў і будзем жыць?
10 Бо тыя каралі, як самі думалі, на некалькі дзён; а Ён — на карысьць [нашую], каб нам
удзельнічаць у сьвятасьці Яго.
11 Усякае ж пакараньне ў цяперашні час здаецца ня радасьцю, але смуткам; а пасьля дае
навучаным праз яго мірны плод праведнасьці.
12 Дзеля гэтага выпрастуйце рукі, што апусьціліся, і калені, што самлелі,
13 і сьцежкі простыя рабіце нагамі вашымі, каб кульгавае нікуды ня збочыла, а лепш было
аздароўленае.
14 Імкніцеся да супакою з усімі і да сьвятасьці, без якое ніхто ня ўбачыць Госпада,
15 гледзячы, каб хто ня страціў ласкі Божае; каб які корань горычы, вырасшы ўверх, не зрабіў
шкоды, і каб праз яго не занячысьціліся многія;
16 каб не было якога распусьніка ці паганага, як Эзаў, які за адну ежу аддаў першародзтва сваё.
17 Бо ведаеце, што і пасьля ён, хочучы ўспадкаеміць дабраслаўленьне, быў адкінуты, бо не
знайшоў месца навяртаньня, хоць і шукаў яго са сьлязьмі.
18 Бо не падыйшлі вы да гары, да якой [можна] дакрануцца і якая палае агнём, ані да віхуры, і
цемры, і буры,
19 ані да гуку трубы і голасу словаў, пра якія тыя, што чулі, прасілі, каб да іх не было больш
слова,
20 бо ня вытрымалі перасьцярогі: «Калі і зьвер кранецца гары, будзе ўкаменаваны ці стралою
забіты»,
21 і гэткая жахлівая была тая праява, што Майсей сказаў: «Я напалоханы і трасуся».
22 Але вы падыйшлі да гары Сыён і да гораду Бога Жывога, да нябеснага Ерусаліму і да
дзясяткаў тысячаў анёлаў,
23 да вальнага зграмаджэньня і царквы першародных, якія запісаныя ў небе, і да Бога, Судзьдзі
ўсіх, і да духаў праведных і дасканалых,

24 і да Пасярэдніка новага запавету, Ісуса, і да крыві пакрапленьня, якая лепш за Абэлеву
гаворыць.
25 Глядзіце, не адвярніцеся ад Таго, Які гаворыць. Бо калі не ўцяклі тыя, што адвярнуліся ад
таго, які прамаўляў на зямлі, тым больш мы, калі адкінем Таго, Які з неба,
26 голас Якога тады захістаў зямлю, а цяпер абяцаў, кажучы: “Яшчэ раз страсяну ня толькі
зямлю, але і неба”.
27 А [словы] “яшчэ раз” паказваюць на зьмену таго, што хістаецца, як створанага, каб засталося
тое, што не хістаецца.
28 Дзеля гэтага мы, прыймаючы Валадарства непарушнае, будзем мець ласку, праз якую
будзем служыць Богу, падабаючыся [Яму], з сарамлівасьцю і багабойнасьцю,
29 бо Бог наш — агонь, які паглынае.

Гебр 13

1 Любоў братняя няхай застаецца.
2 Пра гасьціннасьць не забывайцеся, бо праз яе некаторыя, ня ведаючы, гасьцявалі анёлаў.
3 Памятайце пра вязьняў, нібы ўвязьненыя разам [з імі], і пра тых, што ў нягодах, як тыя, якія
самі ў целе.
4 Сужонства [няхай будзе] шанаванае ў-ва ўсіх і сужыцьцё беззаганнае; а распусьнікаў і
чужаложнікаў будзе судзіць Бог.
5 Ня будзьце срэбралюбныя, задавальняючыся тым, што маеце. Бо Ён сказаў: «Не адпушчу
цябе і не пакіну цябе»,
6 так што, маючы пэўнасьць, мы кажам: «Госпад мне ўспамога, і не спалохаюся, што зробіць
мне чалавек?».
7 Памятайце кіраўнікоў вашых, якія казалі вам слова Божае; і, аглядаючы вынік жыцьця іх,
пераймайце веру [іхнюю].
8 Ісус Хрыстос учора і сёньня Той Самы, і на вякі.
9 Вучэньнямі рознымі і чужымі не захапляйцеся; бо добра ласкай мацаваць сэрца, а ня ежай,
ад якой ня мелі карысьці тыя, што ходзяць [за ёю].
10 Мы маем ахвярнік, з якога ня маюць права есьці тыя, якія служаць у намёце.
11 Бо як целы тых жывёлаў, кроў якіх за грахі прыносіцца першасьвятаром у сьвятыню,
спальваюцца па-за табарам;
12 дзеля гэтага і Ісус, каб асьвяціць праз кроў Сваю народ, пакутаваў за брамамі.
13 Дык выйдзем да Яго па-за табар, пераносячы зьнявагі Ягоныя,
14 бо мы ня маем тут трывалага гораду, але шукаем будучага.
15 Дык будзем праз Яго прыносіць Богу няспынна ахвяры хвалы, гэта ёсьць плод вуснаў, якія
вызнаюць імя Ягонае.
16 Пра дабрадзейнасьць і супольнасьць не забывайцеся, бо гэткія ахвяры падабаюцца Богу.
17 Слухайцеся кіраўнікоў вашых і будзьце пакорнымі, бо яны чуваюць над душамі вашымі, як
абавязаныя здаць справаздачу [за іх], каб яны рабілі гэта з радасьцю, а не ўздыхаючы, бо гэта
для вас некарысна.
18 Маліцеся за нас; бо мы перакананыя, што маем добрае сумленьне, у-ва ўсім хочучы жыць
справядліва.
19 Асабліва ж прашу рабіць гэта, каб я хутчэй быў вам вернуты.
20 А Бог супакою, Які падняў з мёртвых у крыві вечнага запавету вялікага Пастыра авечак,
Госпада нашага Ісуса,
21 няхай удасканаліць вас у-ва ўсякай справе добрай, дзеля выкананьня волі Ягонай, робячы
ў вас тое, што даспадобы Яму, праз Ісуса Хрыста, Якому слава на вякі вякоў. Амэн.
22 Прашу ж вас, браты, прыйміце слова пацяшэньня, бо я ж крыху напісаў вам.
23 Ведайце, што брат наш Цімафей вызвалены; з ім разам, калі хутка прыйдзе, угледжу я вас.
24 Прывітайце ўсіх кіраўнікоў вашых і ўсіх сьвятых. Вітаюць вас тыя, што з Італіі.
25 Ласка з усімі вамі. Амэн.

ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ЯКУБА

1 Якуб, слуга Бога і Госпада Ісуса Хрыста, — дванаццаці каленам, што ў расьцярушаньні:
радавацца!
2 Вялікай радасьцю лічыце, браты мае, калі трапляеце ў розныя спакусы,
3 ведаючы, што выпрабаваньне вашае веры робіць цярплівасьць.
4 А цярплівасьць няхай мае дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалымі і суцэльнымі, без
аніякага недахопу.
5 Калі ж у каго з вас не хапае мудрасьці, няхай просіць у Бога, Які дае ўсім шчыра і не
дакараючы, і будзе яму дадзена.
6 Але няхай просіць з вераю, ані не сумняваючыся, бо той, хто сумняецца, падобны да
хваляваньня марскога, якое вецер уздымае і ганяе.
7 Дык няхай не мяркуе гэтакі чалавек, што нешта атрымае ад Госпада.
8 Двудушны чалавек няцьвёрды на ўсіх шляхах сваіх.
9 Няхай жа хваліцца паніжаны брат сваёй высокасьцю,
10 а багаты — сваім паніжэньнем, бо праміне, як кветка на траве.
11 Бо ўзыходзіць сонца са сьпёкаю і сушыць траву, і кветка яе падае, і хараство аблічча яе
зьнікае; гэтак і багаты на шляхах сваіх счэзьне.
12 Шчасьлівы чалавек, які вытрымлівае спакусу, бо, стаўшыся выпрабаваным, ён атрымае
вянок жыцьця, які абяцаў Госпад тым, хто любіць Яго.
13 Спакушаны, ніхто няхай ня кажа: «Бог мяне спакушае», бо Бог не спакушаецца злом, і Сам
нікога не спакушае.
14 А кожны спакушаецца, захоплены і прываблены ўласным пажаданьнем;
15 пасьля пажаданьне, зачаўшы, нараджае грэх, а грэх, як яго давесьці да канца, спараджае
сьмерць.
16 Не падманвайцеся, браты мае ўлюбёныя:
17 усякі дар добры і ўсякі дарунак дасканалы зыходзяць з вышыні, ад Айца сьвятла, у Якога
няма рознасьці, ані ценю зьменлівасьці.
18 Захацеўшы, Ён спарадзіў нас словам праўды, каб быць нам нейкім пачаткам стварэньняў
Ягоных.
19 Так што, браты мае ўлюбёныя, усякі чалавек няхай будзе хуткі, каб слухаць, павольны, каб
гаварыць, павольны на гнеў,
20 бо гнеў чалавека ня чыніць праведнасьці Божае.
21 Дзеля гэтага, адкінуўшы ўсякі бруд і празьмернасьць ліхоты, у ціхасьці прыйміце
насаджанае слова, якое можа збавіць душы вашыя.
22 Будзьце ж выканаўцамі слова, а не слухачамі толькі, якія ўводзяць у зман саміх сябе.
23 Бо хто слухае слова і не выконвае, той падобны да чалавека, які разглядае аблічча сваё, [якое
мае ад] нараджэньня, у люстэрку;
24 бо ён паглядзеў на сябе, і адыйшоў, і адразу забыўся, які ён.
25 А хто прыхіляецца да дасканалага закону свабоды і трывае [ў ім], той, стаўшыся не
слухачом, які забываецца, але выканаўцам справы, шчасьлівы будзе ў дзейнасьці сваёй.
26 Калі хто сярод вас думае, што ён пабожны, і не цугляе язык свой, але падманвае сэрца сваё,
у таго пабожнасьць марная.
27 Чыстая і беззаганная пабожнасьць перад Богам і Айцом ёсьць у тым, каб адведваць сіротаў
і ўдоваў у горы іхнім і захоўваць сябе неапаганеным ад сьвету.

Як 2

1 Браты мае! Не ўзіраючыся на аблічча, мейце веру ў Госпада нашага Ісуса Хрыста
праслаўленага.

2 Бо калі ў збор ваш увойдзе чалавек з залатым пярсьцёнкам, у сьветлым адзеньні, і ўвойдзе
ўбогі ў брудным адзеньні,
3 і вы глянеце на таго, які носіць сьветлае адзеньне, і скажаце яму: «Табе добра сесьці тут», а
ўбогаму скажаце: «Ты стань там», ці: «Сядай тут, ля падножжа майго»,
4 ці не ўчынілі вы розьніцы ў саміх сабе і ці ня сталіся судзьдзямі са злымі думкамі?
5 Паслухайце, браты мае ўлюбёныя, ці ж ня ўбогіх сьвету гэтага выбраў Бог быць багатымі ў
веры і спадкаемцамі Валадарства, якое Ён абяцаў тым, што любяць Яго?
6 А вы зьняважылі ўбогага. Ці ж не багатыя прыгнятаюць вас, і ці ж не яны цягаюць вас у суды?
7 Ці ж не яны блюзьняць на добрае імя, якое вы прызываеце?
8 Калі, аднак, вы спаўняеце валадарскі закон паводле Пісаньня: «Любі бліжняга твайго як
самога сябе», добра робіце;
9 а калі на аблічча ўзіраецеся, чыніце грэх і дакараныя законам як парушальнікі.
10 Бо хто захоўвае ўвесь Закон, але спатыкнецца ў [нечым] адным, той стаўся вінным у-ва ўсім.
11 Бо Той, Які сказаў: «Не чужалож», сказаў таксама: «Не забівай». Дык калі ты не чужаложыш,
але заб'еш, ты стаўся парушальнікам Закону.
12 Гэтак гаварыце і гэтак рабіце, як тыя, што маюць быць суджаны паводле закону свабоды.
13 Бо суд бяз літасьці для таго, хто не ўчыніў літасьці; і ласка па-над суд вывышаецца.
14 Якая карысьць, браты мае, калі хто кажа, што мае веру, а ўчынкаў ня мае? Ня можа гэтая
вера збавіць яго.
15 Калі брат ці сястра ня маюць адзеньня і не хапае ім ежы на дзень,
16 а нехта з вас скажа ім: «Ідзіце ў супакоі, грэйцеся і насычайцеся», але ня дасьць ім
патрэбнага для цела, якая карысьць?
17 Гэтак і вера, калі ня мае ўчынкаў, сама па сабе мёртвая.
18 Але нехта скажа: «Ты маеш веру, а я маю ўчынкі». Пакажы мне веру тваю без учынкаў тваіх,
і я з маіх учынкаў пакажу табе маю веру.
19 Ты верыш, што Бог адзін, — добра робіш. І дэманы вераць і дрыжаць.
20 Але ці хочаш ведаць, чалавек нікчэмны, што вера без учынкаў мёртвая?
21 Ці ж не праз учынкі апраўдаўся Абрагам, бацька наш, узьнёсшы на ахвярнік Ісаака, сына
свайго?
22 Бачыш, што вера дапамагала ўчынкам ягоным, і праз учынкі вера завяршылася.
23 І споўнілася Пісаньне, якое кажа: «Паверыў Абрагам Богу, і залічана яму за праведнасьць»,
і: «Сябрам Богу быў ён названы».
24 Дык паглядзіце, што чалавек апраўдваецца праз учынкі, а не праз веру толькі.
25 Падобна і Рахаў распусьніца ці не праз учынкі была апраўданая, прыняўшы пасланцоў і
выправіўшы [іх] другой дарогаю?
26 Бо, як цела бяз духа мёртвае, гэтак і вера мёртвая без учынкаў.

Як 3

1 Ня многія рабіцеся настаўнікамі, браты мае, ведаючы, што мы большы атрымаем прысуд,
2 бо ўсе мы шмат спатыкаемся. Хто не спатыкаецца ў слове, той дасканалы чалавек, які мае
моц, каб зацугляць і ўсё цела.
3 Вось, мы ўкладаем цуглі ў рот коням, каб мець пэўнасьць у іх, і кіруем усім целам іхнім.
4 Вось і караблі, такія вялікія, і вятры магутныя іх носяць, а невялікім стырном кіруюцца, куды
корнік хоча.
5 Гэтак і язык — малы член, а шмат узносіцца. Вось, маленькі агонь, а які вялікі лес запальвае.
6 І язык — агонь, сьвет няправеднасьці. Язык гэтак зьмяшчаецца сярод членаў нашых, што
апаганьвае ўсё цела, і запальвае круг жыцьця, і сам запальваецца ад геенны.
7 Бо ўсякая прырода зьвяроў, і птушак, і паўзуноў, і марскіх жывёлаў таймуецца і ўтаймавана
прыродаю чалавечаю,
8 а языка ніхто з людзей утаймаваць ня можа; ён — нястрымнае ліха, поўны сьмяротнай
атруты.

9 Ім дабраслаўляем Бога і Айца і ім праклінаем людзей, што створаны на падабенства Бога;
10 з тых самых вуснаў выходзіць дабраслаўленьне і праклён. Не павінна быць гэтак, браты мае.
11 Ці з аднаго жарала крыніцы выцякае салодкая і горкая [вада]?
12 Ня можа, браты мае, фігавае дрэва радзіць аліўкі, або вінаградная лаза — фігі; гэтаксама адна крыніца — даваць салёную і салодкую ваду.
13 Хто з вас мудры і мае розум, няхай пакажа гэта справамі сваімі праз добры лад жыцьця з ціхасьцю мудрасьці.
14 А калі ў вашым сэрцы вы маеце горкую зайздрасьць і сварлівасьць, не вывышайцеся і не хлусіце насуперак праўдзе.
15 Гэта ня ёсьць мудрасьць, якая з вышыні зыходзіць, але зямная, душэўная, дэманава,
16 бо дзе зайздрасьць і сварлівасьць, там бязладзьдзе і ўсякія благія рэчы.
17 Але мудрасьць, якая з вышыні, па-першае, — чыстая, пасьля — мірная, спагадная, саступлівая, поўная літасьці і добрых пладоў, бесстаронная і некрывадушная.
18 Плод жа праведнасьці ў супакоі сеецца тымі, якія робяць супакой.

Як 4

1 Адкуль войны і звадкі між вамі? Ці не адсюль, з [пажаданьня] асалодаў вашых, якія змагаюцца ў членах вашых?
2 Вы жадаеце і ня маеце; забіваеце і зайздросьціце, і ня можаце атрымаць, вадзіцеся і ваюеце; а ня маеце дзеля таго, што ня просіце.
3 Просіце і не атрымліваеце, бо блага просіце, каб выдаткаваць дзеля асалоды вашай.
4 Чужаложнікі і чужаложніцы! Ці вы ня ведаеце, што сяброўства са сьветам ёсьць варожасьць супраць Бога? Дык хто хоча быць сябрам сьвету, той робіцца ворагам Богу.
5 Ці вы думаеце, што надарма кажа Пісаньне: «Да рэўнасьці прагне Дух, Які жыве ў нас»?
6 Але яшчэ большую дае ласку і дзеля гэтага кажа: «Бог пыхлівым працівіцца, а пакорным ласку дае».
7 Дык падпарадкуйцеся Богу; супраціўцеся д'яблу, і ўцячэ ад вас.
8 Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас. Ачысьціце рукі, грэшнікі, выпраўце сэрцы, двудушныя!
9 Скрушайцеся, плачце і галасіце; няхай сьмех ваш пераменіцца ў плач, і радасьць — у смутак.
10 Панізьцеся перад Госпадам, і Ён узвысіць вас.
11 Не ачарняйце, браты, адзін аднаго. Хто ачарняе брата і судзіць брата свайго, той ачарняе Закон і судзіць Закон. А калі ты судзіш Закон, ты не выканаўца Закону, але судзьдзя.
12 Адзін ёсьць Заканадаўца, Які можа збавіць і загубіць. А хто ты, які судзіш другога?
13 Паслухайце цяпер вы, якія кажаце: «Сёньня і заўтра пойдзем у такі і такі горад, і будзем там адзін год, і будзем гандляваць і зарабляць»,
14 вы, якія ня ведаеце, што [будзе] заўтра. Бо што такое жыцьцё вашае? Бо яно — пара, якая зьяўляецца на малы [час], а потым чэзьне.
15 Замест таго, каб гаварыць вам: «Калі Госпад захоча і будзем жывыя, зробім тое ці другое»,
16 вы цяпер праз пыху сваю хваліцеся. Усякая гэткая пахвальба ёсьць зло.
17 Дык хто ведае, як рабіць дабро, і ня робіць, грэх таму.

Як 5

1 Паслухайце цяпер вы, багатыя! Галасіце і плачце дзеля няшчасьцяў вашых, якія прыходзяць!
2 Багацьце вашае згніло, і шаты вашыя моль стачыла.
3 Золата вашае і срэбра паржавела, і іржа іхняя сьведчыць супраць вас і зьесьць цела вашае, як агонь. Вы сабралі сабе скарб на апошнія дні.
4 Вось плата, якой вы пазбавілі работнікаў, што пажалі палі вашыя, кліча, і лямант жнэцоў дайшоў да вушэй Госпада Магуцьцяў.
5 Вы мелі раскошу на зямлі і жылі ў распусьце; вы насыцілі сэрцы вашыя, быццам на дзень, калі будзеце на зарэз.

6 Вы асудзілі, забілі Праведнага; Ён не супрацьстаў вам.
7 Дык будзьце доўгацярплівымі, браты, да прыйсьця Госпада. Вось, земляроб чакае каштоўнага плоду зямлі, і дзеля яго доўгацярплівы, аж пакуль атрымае дождж раньні і позьні.
8 Будзьце доўгацярплівымі і вы, умацуйце сэрцы вашыя, бо прыйсьце Госпада набліжаецца.
9 Не наракайце, браты мае, адзін на аднаго, каб ня быць асуджанымі. Вось, Судзьдзя стаіць перад дзьвярыма.
10 За прыклад злыбедаў і доўгацярплівасьці вазьміце, браты мае, прарокаў, якія гаварылі ў імя Госпада.
11 Вось, мы шчасьлівымі называем тых, якія вытрывалі. Вы чулі пра цярплівасьць Ёва і ведаеце канец [яго] ад Госпада, бо Госпад вельмі спагадлівы і міласэрны.
12 Дык перш за ўсё, браты мае, не прысягайцеся ані небам, ані зямлёю, ані якою другою прысягаю, але няхай будзе ў вас «Так, так» і «Не, не», каб вам не патрапіць пад суд.
13 Мае злыбеды нехта з вас? Няхай моліцца. Бадзёры хто? Няхай псальмы сьпявае.
14 Захварэў хто з вас? Няхай пакліча старостаў царквы, і няхай тыя памоляцца над ім, памазаўшы яго алеем у імя Госпада,
15 і малітва веры збавіць нямоглага, і Госпад падыме яго; і калі ён грахі ўчыніў, будзе адпушчана яму.
16 Вызнавайце адзін аднаму грахі і маліцеся адзін за аднаго, каб быць аздароўленымі. Шмат можа настойлівая просьба праведніка!
17 Ільля быў чалавек, падобны да нас, і малітваю памаліўся, каб не ішоў дождж, і не ішоў дождж на зямлю тры гады і шэсьць месяцаў.
18 І ізноў памаліўся, і неба дало дождж, і зямля ўзрасьціла плод свой.
19 Браты, калі хто з вас ухіліўся ад праўды, і нехта наверне яго,
20 няхай ведае, што той, які навярнуў грэшніка з памылковага шляху ягонага, збавіць душу [ягоную] ад сьмерці і прыкрые мноства грахоў.

ПЕРШАЕ ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ПЯТРА

1 Пётар, апостал Ісуса Хрыста, — выбраным вандроўнікам, расьцярушаным у Поньце, Галятыі,
Кападокіі, Азіі і Бітыніі,
2 паводле прадбачаньня Бога Айца, праз асьвячэньне Духа, дзеля паслухмянасьці і
пакрапленьня крывёю Ісуса Хрыста: ласка і супакой няхай вам памножацца!
3 Дабраслаўлёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які паводле вялікай літасьці Сваёй
адрадзіў нас праз уваскрасеньне Ісуса Хрыста з мёртвых дзеля жывое надзеі,
4 дзеля спадчыны незьнішчальнае і беззаганнае, якая не завяне і якая захоўваецца ў небе дзеля
нас,
5 якія сілаю Божаю праз веру захаваныя дзеля збаўленьня, гатовага адкрыцца ў апошні час.
6 З гэтага радуйцеся, крыху цяпер, калі трэба, ад розных спакусаў пасмуткаваўшы,
7 каб выпрабаваньне веры вашае, якая шмат каштоўнейшая за золата, што гіне, хоць і агнём
выпрабоўваецца, было знойдзена на хвалу, і пашану, і славу ў адкрыцьці Ісуса Хрыста,
8 Якога, ня бачыўшы, любіце і дзеля Якога, хоць не аглядаючы, але верачы [ў Яго], радуецеся
радасьцю невымоўнаю і найслаўнейшаю,
9 атрымліваючы вынік веры вашае — збаўленьне душаў.
10 Гэтага збаўленьня шукалі і дапытываліся прарокі, якія прарочылі пра ласку адносна вас,
11 дасьледуючы, пра што ці пра якую пару паведамляў у іх Дух Хрыстовы, прадвяшчаючы
пакуты Хрыстовыя і славу пасьля іх.
12 Ім было адкрыта, што ня ім, але нам служыла абвешчанае вам цяпер тымі, якія дабравесьцілі
вам у Духу Сьвятым, Які пасланы з неба, да чаго анёлы жадаюць прыхіліцца.
13 Дзеля гэтага, падперазаўшы паясьніцы розуму вашага і будучы цьвярозымі, да канца
спадзявайцеся на ласку, якая прыносіцца вам у адкрыцьці Ісуса Хрыста.
14 Як паслухмяныя дзеці, не прыпадабняйцеся ранейшым пажаданьням у няведаньні вашым,
15 але, паводле [прыкладу] Сьвятога, Які паклікаў вас, і самі будзьце сьвятымі ў-ва ўсім ладзе
жыцьця,
16 бо напісана: «Будзьце сьвятыя, бо Я — Сьвяты».
17 І калі называеце Айцом Таго, Які судзіць кожнага паводле справаў ягоных, не ўзіраючыся
на аблічча, са страхам праводзьце час вандраваньня вашага,
18 ведаючы, што не зьнішчальным срэбрам ці золатам выбаўлены вы ад марнага ладу жыцьця,
перададзенага ад бацькоў,
19 але каштоўнай крывёю Хрыста, як Ягняці беззаганнага і неапаганенага,
20 прадвызначанага яшчэ да стварэньня сьвету, але зьяўленага ў апошнія часы дзеля вас,
21 якія паверылі праз Яго ў Бога, Які ўваскрасіў Яго з мёртвых і даў Яму славу, каб вера вашая
і надзея была ў Богу.
22 Ачысьціўшы душы вашыя паслухмянасьцю праўдзе праз Духа дзеля некрывадушнага
браталюбства, з чыстым сэрцам шчыра любіце адзін аднаго,
23 як тыя, што адроджаныя не са зьнішчальнага насеньня, але з незьнішчальнага, праз слова
Бога Жывога, Які трывае на вякі.
24 Бо ўсякае цела — як трава, і ўсякая слава чалавечая — як кветка на траве; засохла трава, і
кветка яе ўпала,
25 але слова Госпада трывае на вякі. А гэта ёсьць тое слова, якое вам дабравешчана.

1 Пт 2

1 Дык адклаўшы ўсякую ліхоту, і ўсякі подступ, і крывадушнасьць, і зайздрасьць, і ўсякія
абмаўляньні,
2 як нованароджаныя немаўляты, зажадайце чыстага слоўнага малака, каб ад яго вы расьлі,
3 бо вы пакаштавалі, што Госпад добры.
4 Падыходзячы да Яго, жывога Камяня, адкінутага людзьмі, але выбранага Богам, каштоўнага,

5 і самі, як жывыя камяні, будуйцеся ў дом духоўны, сьвятарства сьвятое, каб узносіць
духоўныя ахвяры, адпаведныя Богу, праз Ісуса Хрыста.
6 Дзеля гэтага і зьмешчана ў Пісаньні: «Вось, Я кладу ў Сыёне кутні Камень, выбраны,
каштоўны, і хто верыць у Яго, ня будзе асаромлены».
7 Дык Ён для вас, якія вераць, — каштоўнасьць, а для тых, якія ня вераць, — камень, які адкінулі
будаўнікі, які стаўся галавой вугла,
8 камень спатыкненьня і скала згаршэньня для тых, якія спатыкаюцца аб слова, не
скараючыся, дзеля чаго і пакінутыя.
9 А вы — выбраны род, валадарнае сьвятарства, народ сьвяты, людзі, атрыманыя як удзел, каб
абвяшчаць цноты Таго, Які паклікаў вас з цемры ў дзівоснае сьвятло Сваё,
10 некалі не народ, а цяпер — народ Божы; [некалі] не мілаваныя, а цяпер — памілаваныя.
11 Улюбёныя, прашу вас, як прыхадняў і вандроўнікаў, высьцерагайцеся цялесных
пажаданьняў, якія змагаюцца супраць душы,
12 і мейце добры лад жыцьця між паганамі, каб яны за тое, за што ачарняюць вас, як ліхадзеяў,
гледзячы на добрыя справы [вашыя], славілі Бога ў дзень адведзінаў.
13 Дык падпарадкоўвайцеся ўсякаму стварэньню чалавечаму дзеля Госпада, ці то валадару, як
вышэйшай [уладзе],
14 ці то ваяводам, як праз яго пасыланым дзеля помсты ліхадзеям і дзеля пахвалы тым, якія
робяць дабро.
15 Бо гэткая ёсьць воля Божая, каб мы, робячы дабро, прымушалі замаўчаць невуцтва
неразумных людзей,
16 як свабодныя, і не як тыя, што свабоду маюць як падставу для ліхоты, але як слугі Божыя.
17 Усіх паважайце, брацтва любіце, Бога бойцеся, валадара шануйце.
18 Слугі, з усякім страхам падпарадкоўвайцеся ўладарам, ня толькі добрым і спагадным, але і
круцельскім.
19 Бо гэта ласка [Божая], калі хто дзеля сумленьня Божага пераносіць смутак, церпячы
несправядліва.
20 Бо што за слава, калі вы трываеце, як б'юць вас за грахі? Але калі робячы дабро і церпячы,
трываеце, гэта ласка ў Бога.
21 Бо вы на гэта пакліканыя, бо і Хрыстос перацярпеў за нас, пакінуўшы нам прыклад, каб мы
ішлі па сьлядах Ягоных.
22 Ён не зрабіў аніякага грэху, і не было подступу ў вуснах Ягоных.
23 Ён, зьневажаны, не зьневажаў у адказ, церпячы, не пагражаў, а перадаў [суд] Таму, Хто
судзіць справядліва.
24 Ён грахі нашыя Сам узьнёс у целе Сваім на дрэва, каб мы, памёршы дзеля грахоў, жылі ў
праведнасьці; ранамі Ягонымі вы аздароўленыя.
25 Бо вы былі як авечкі, што заблукалі, але цяпер вярнуліся да Пастыра і Епіскапа душаў вашых.

1 Пт 3

1 Таксама і вы, жонкі, падпарадкоўвайцеся сваім мужам, каб і тыя, што не скараюцца слову,
ладам жыцьця жонак бяз слова былі здабываныя,
2 гледзячы на чыстае жыцьцё вашае ў страху [Божым].
3 Няхай будзе [аздобаю] ня вонкавае заплятаньне валасоў і залатыя ўпрыгожваньні або
апрананьне ў шаты сьвету,
4 але таемны сэрца чалавек у незьнішчальнасьці ціхага і спакойнага духа, што вельмі каштоўна
перад Богам.
5 Бо гэтак некалі аздаблялі сябе, падпарадкоўваючыся сваім мужам, і сьвятыя жанчыны, якія
спадзяваліся на Бога.
6 Гэтак Сара слухалася Абрагама, называючы яго гаспадаром, і вы сталіся дзецьмі яе, калі
робіце дабро і не палохаецеся аніякага страху.

7 Таксама і вы, мужы, жывіце з разуменьнем з жонкамі, аддаючы ім, як найслабейшай
пасудзіне, пашану, бо і яны — суспадчыньніцы ласкі жыцьця, каб не было перашкоды ў
малітвах вашых.
8 Нарэшце, будзьце ўсе аднадумныя, спачувайце адзін аднаму, [будзьце] браталюбныя,
спагадлівыя, пачцівыя,
9 не аддавайце ліхам за ліха ці зьнявагай за зьнявагу, а, наадварот, дабраслаўляйце, ведаючы,
што вы дзеля гэтага пакліканыя, каб узяць у спадчыну дабраслаўленьне.
10 Бо хто хоча жыцьцё любіць і бачыць добрыя дні, няхай стрымлівае язык свой ад ліхоты і
вусны свае, каб не гаварылі падступна,
11 няхай ухіляецца ад ліха і робіць дабро; няхай шукае супакою і імкнецца да яго.
12 Бо вочы Госпада — на праведных, і вушы Ягоныя — да просьбаў іхніх, але аблічча Госпада —
супраць тых, якія робяць ліхое.
13 І хто зробіць вам зло, калі вы станецеся пераймальнікамі добрага?
14 Але калі вы і пацярпелі за праведнасьць, вы шчасьлівыя. А страху іхняга не палохайцеся і
не трывожцеся.
15 Госпада Бога сьвяціце ў сэрцах вашых. Будзьце заўсёды гатовыя даць адказ кожнаму, хто
просіць у вас слова адносна вашае надзеі, з ціхасьцю і са страхам,
16 маючы добрае сумленьне, каб у тым, за што ачарняюць вас, як ліхадзеяў, былі асаромленыя
тыя, якія ганяць ваш добры лад жыцьця ў Хрысьце.
17 Бо, калі хоча воля Божая, лепш цярпець, робячы добрае, чым робячы благое.
18 Бо і Хрыстос, каб прывесьці нас да Бога, раз пацярпеў за грахі, Праведны — за няправедных,
забіты целам, але ажыўлены Духам,
19 у Якім Ён, пайшоўшы, абвяшчаў духам, што ў вязьніцы,
20 тым, якія некалі не скарыліся, калі чакала іх Божае доўгацярпеньне ў дні Ноя, пры
будаваньні каўчэга, у якім некалькі, гэта значыцца восем душаў, былі ўратаваныя ад вады.
21 Гэтак і нас цяпер на ўзор гэтага хрышчэньне — не абмыцьцё бруду цела, але абяцаньне Богу
добрага сумленьня, — збаўляе праз уваскрасеньне Ісуса Хрыста,
22 Які, узыйшоўшы ў неба, знаходзіцца праваруч Бога, і Яму падпарадкаваныя анёлы, і ўлады,
і сілы.

1 Пт 4

1 Дык як Хрыстос цярпеў за нас целам, і вы ўзбройцеся такой думкаю, што той, хто церпіць
целам, перастае грашыць,
2 каб рэшту часу ў целе жыць не паводле чалавечых пажаданьняў, але паводле волі Божае.
3 Бо досыць ужо, што мы ў мінулы час жыцьця выконвалі волю паганаў, ходзячы
ў бессаромнасьці, пажаданьнях, абпіваньні віном, гулянках, банкетаваньнях і агідным
ідалапаклонстве.
4 Таму яны зьдзіўляюцца, што вы не бежыцё з імі на гэты разьліў распусты, і блюзьняць.
5 Яны дадуць справаздачу Таму, Хто гатовы судзіць жывых і мёртвых.
6 Бо дзеля гэтага і мёртвым было дабравешчана, каб яны, суджаныя па-чалавечаму целам,
жылі па-Божаму духам.
7 А канец усяму набліжаецца. Дык будзьце пры розуме і цьвярозымі ў малітвах.
8 А перш за ўсё мейце нязьменную любоў адзін да аднаго, бо любоў прыкрые мноства грахоў.
9 Будзьце гасьцінныя адны да адных без нараканьняў.
10 Служыце адзін аднаму кожны тым дарам [ласкі], які атрымаў, як добрыя аканомы
разнастайнае ласкі Божае.
11 Калі хто гаворыць — як словы Божыя; калі хто служыць — па сіле, якую дае Бог, каб у-ва ўсім
славіўся Бог праз Ісуса Хрыста, Якому слава і ўлада на вякі вякоў. Амэн.
12 Улюбёныя! Не зьдзіўляйцеся вогненнаму [выпрабаваньню], якое стаецца дзеля
спакушэньня вас, нібы нешта дзіўнае здарылася.
13 Але, як супольнікі ў пакутах Хрыстовых, радуйцеся, каб і ў адкрыцьці славы Ягонай
радавацца і весяліцца.

14 Калі зьневажаюць вас за імя Хрыста, вы шчасьлівыя, бо Дух славы, Дух Божы супачывае на
вас. Тыя блюзьняць [на Яго], а вы славіце.
15 Абы толькі не цярпеў хто з вас мукі як забойца, або злодзей, або ліхадзей, або той, хто
квапіцца на чужое;
16 а калі як Хрысьціянін, не саромся, але слаў Бога за гэткі ўдзел.
17 Бо час пачацца суду ад дому Божага. А калі спачатку ад нас, дык які канец тых, якія не
скарыліся Эвангельлю Божаму?
18 І калі праведны ледзьве збавіцца, дык бязбожнік і грэшнік дзе апынуцца?
19 Так што тыя, якія церпяць паводле волі Божай, няхай перададуць Яму, як вернаму Творцу,
душы свае, робячы дабро.

1 Пт 5

1 Старостаў, якія сярод вас, прашу я, сустаршыня і сьведка пакутаў Хрыстовых і супольнік
славы, якая мае адкрыцца:
2 пасьвіце Божы статак, які ў вас, гледзячы за ім не пад прынукаю, але добраахвотна, і не дзеля
прыбыткаў, але з ахвотаю,
3 і не пануючы над спадчынай, але даючы прыклад статку,
4 і калі зьявіцца Найвышэйшы Пастыр, атрымаеце вянок славы, які ня счэзьне.
5 Таксама і вы, маладыя, падпарадкоўвайцеся старостам, а ўсе, падпарадкоўваючыся адзін
аднаму, апраніцеся ў пакорнасьць, бо Бог пыхлівым працівіцца, а пакорным ласку дае.
6 Дык скарыцеся пад уладную руку Божую, каб Ён узьвялічыў вас у свой час.
7 Усе турботы свае ўскладайце на Яго, бо Ён клапоціцца пра вас.
8 Будзьце цьвярозымі, чувайце, бо супраціўнік ваш, д'ябал, як леў рыклівы, ходзіць, шукаючы,
каго праглынуць.
9 Супрацьстаньце яму цьвёрдай вераю, ведаючы, што такія самыя пакуты здараюцца з братамі
вашымі ў сьвеце.
10 А Бог усякае ласкі, Які паклікаў нас, што крыху цярпелі, у вечную славу Сваю ў Хрысьце
Ісусе, няхай Сам удасканаліць вас, няхай умацуе, няхай узмоцніць, няхай угрунтуе.
11 Яму слава і ўлада на вякі вякоў. Амэн.
12 Гэта коратка напісаў я вам праз Сілуана, вернага, як лічу, брата, каб суцешыць і засьведчыць,
што праўдзівая ласка Божая, у якой вы стаіцё.
13 Вітае вас [царква], што ў Бабілоне, выбраная разам з вамі, і Марк, мой сын.
14 Прывітайце адзін аднаго пацалункам любові. Супакой вам усім, якія ў Хрысьце Ісусе. Амэн.

ДРУГОЕ ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ПЯТРА

1 Сымон Пётар, слуга і апостал Ісуса Хрыста, — тым, якія прынялі з намі роўна каштоўную веру
ў праведнасьці Бога нашага і Збаўцы Ісуса Хрыста:
2 ласка вам і супакой няхай памножацца ў пазнаньні Бога і Ісуса, Госпада нашага.
3 Як Боская моц Ягоная падаравала нам усё дзеля жыцьця і пабожнасьці, праз пазнаньне Таго,
Хто паклікаў нас славаю і цнотаю,
4 праз якія падараваныя нам найвялікшыя і каштоўныя абяцаньні, каб праз іх сталіся вы
супольнікамі Боскае прыроды, пазьбегнуўшы сапсутасьці ў пажаданьні, якое ў сьвеце,
5 дык вы, прыкладаючы да гэтага ўсякую дбайнасьць, зьявіце ў веры вашай цноту, а ў цноце —
разуменьне,
6 а ў разуменьні — стрыманасьць, а ў стрыманасьці — цярплівасьць, а ў цярплівасьці —
пабожнасьць,
7 а ў пабожнасьці — браталюбства, а ў браталюбстве — любоў.
8 Калі гэтае ў вас ёсьць і памнажаецца, вы не застанецеся бязьдзейнымі і бясплоднымі ў
пазнаньні Госпада нашага Ісуса Хрыста.
9 Бо хто ня мае гэтага, той сьляпы, невідушчы, забыўся, што атрымаў ачышчэньне даўнейшых
сваіх грахоў.
10 Дзеля гэтага, браты, яшчэ больш намагайцеся рабіць цьвёрдым вашае пакліканьне і
выбраньне, бо гэтак робячы, ніколі не спатыкняцёся,
11 бо гэтак шырока зьявіцца вам уваход у вечнае Валадарства Госпада нашага і Збаўцы Ісуса
Хрыста.
12 Дзеля гэтага я ня буду занядбоўваць заўсёды нагадваць вам пра гэтае, хоць вы і ведаеце гэта,
і ўмацаваныя ў гэтай праўдзе.
13 Справядлівым жа лічу, пакуль знаходжуся ў гэтай будыніне, пабуджаць вас нагадваньнем,
14 ведаючы, што хутка пакіну маю будыніну, як і Госпад наш Ісус Хрыстос мне паведаміў.
15 Але буду намагацца, каб вы і пасьля майго адыходу заўсёды ўспаміналі гэтае.
16 Бо мы зрабілі вядомымі вам моц і прыйсьце Госпада нашага Ісуса Хрыста, не за
мудрагелістымі байкамі ідучы сьледам, але быўшы відавочцамі велічы Ягонай,
17 бо Ён прыняў ад Бога Айца пашану і славу, калі ад велічнае славы зыйшоў да Яго гэтакі голас:
«Гэта ёсьць Сын Мой улюбёны, у Якім маю ўпадабаньне».
18 І гэты голас, які зыходзіў з неба, мы чулі, быўшы з Ім на гары сьвятой.
19 І мы маем цьвёрдае прарочае слова, і вы добра робіце, што зважаеце на яго, як на сьветач,
што сьвеціць у цёмным месцы, пакуль не пачне днець і ня ўзыйдзе зараніца ў сэрцах вашых,
20 разумеючы спачатку, што ніякае прароцтва з Пісаньня ня мае адвольнага тлумачэньня,
21 бо ніколі прароцтва не прыносілася воляй чалавека, але гаварылі яго сьвятыя Божыя людзі,
ведзеныя Духам Сьвятым.

2 Пт 2

1 Былі ж і фальшывыя прарокі, як і ў вас будуць фальшывыя настаўнікі, якія ўвядуць згубныя
герэзіі і адракуцца Уладара, Які адкупіў іх, сьцягваючы на сябе хуткую загубу.
2 І многія пойдуць сьледам за імі на загубу, і праз іх будуць блюзьніць на шлях праўды,
3 і яны ў хцівасьці будуць падкупляць вас лісьлівымі словамі; суд для гэтакіх здаўна не
бязьдзейнічае, і загуба іхняя ня дрэмле.
4 Бо калі Бог не пашкадаваў анёлаў, якія зграшылі, але, кінуўшы [іх] у апраметную ў ковах
змроку, аддаў пільнаваць дзеля суду;
5 і калі не пашкадаваў старадаўнага сьвету, але васьмёх з Ноем, весьнікам праведнасьці,
захаваў, як навёў быў патоп на сьвет бязбожнікаў;

6 і калі гарады Садом і Гамору, зрабіўшы попелам, асудзіў на зруйнаваньне, даючы прыклад
для будучых бязбожнікаў,
7 а праведнага Лота, крыўджанага бессаромным ладам жыцьця беззаконьнікаў, выбавіў,
8 бо гэты праведнік, жывучы між імі, з дня ў дзень мучыў праведную душу [сваю], бачачы і
чуючы справы беззаконныя,
9 дык ведае Госпад, як выбаўляць пабожных ад спакусы, а нягоднікаў захоўваць на дзень суду
дзеля пакараньня,
10 а найбольш тых, якія ідуць за целам у нячыстых пажаданьнях і пагарджаюць панаваньнем,
якія дзёрзкія, самалюбныя і не баяцца блюзьніць супраць славы,
11 тады як анёлы, большыя [за іх] магутнасьцю і сілай, не выносяць на іх перад Госпадам
блюзьнерчага суду.
12 Яны, як неразумныя жывёлы прыродныя, народжаныя на ловы і зьнішчэньне, блюзьняць
на тое, чаго ня ведаюць, і ў сапсутасьці сваёй зьнішчаны будуць.
13 Яны атрымаюць нагароду няправеднасьці, за асалоду лічачы штодзённыя раскошы.
Плюгаўцы і паскуднікі, яны насалоджваюцца падманамі сваімі, банкетуючы з вамі,
14 вочы маюць поўныя чужалоства і нясупыннага грэху, яны прываблiваюць душы
неўгрунтаваныя; дзеці праклёну, яны маюць сэрцы, спрактыкаваныя ў хцівасьці.
15 Пакінуўшы просты шлях, яны заблукалі, ідучы па шляху Білеама Басоравага, які палюбіў
нагароду няправеднасьці,
16 але меў дакараньне за сваё беззаконьне: бязмоўная асьліца, прагаварыўшы чалавечым
голасам, затрымала шаленства прарока.
17 Яны — крыніцы бязводныя, аблокі, бурай ганяныя, для якіх змрок цемры на вякі
захоўваецца.
18 Бо, гаворачы пыхліва марнасьць, яны прываблiваюць пажаданьнямі цела і бессаромнасьцю
[людзей], якія ледзь пазьбеглі тых, што жывуць у падмане.
19 Яны абяцаюць ім свабоду, а самі яны — слугі сапсутасьці, бо хто кім пераможаны, той таму
і стаўся слугою.
20 Бо калі яны, уцёкшы ад апаганьваньня сьвету праз пазнаньне Госпада і Збаўцы нашага Ісуса
Хрыста, ізноў даўшы зьвязаць сябе, пераможаныя ім, апошняе для іх горш за першае.
21 Бо лепш ім было не пазнаць шляху праведнасьці, чым, пазнаўшы, адвярнуцца ад
перададзенага ім сьвятога прыказаньня.
22 Але з імі здарылася паводле праўдзівае прыказкі: «Сабака варочаецца да ванітаў сваіх, а
вымытая сьвіньня — качацца ў лужыне».

2 Пт 3

1 Гэта ўжо другое пасланьне пішу да вас, улюбёныя, у якім нагадваньнем пабуджаю чыстае
разуменьне вашае,
2 каб вы ўзгадалі словы, раней сказаныя сьвятымі прарокамі, і прыказаньне Госпада і Збаўцы,
[перададзенае] апосталамі нашымі,
3 разумеючы спачатку, што ў апошнія дні прыйдуць лаяльнікі, якія ходзяць паводле сваіх
уласных пажаданьняў,
4 і кажуць: «Дзе абяцаньне прыйсьця Ягонага? Бо ад [часу], як сталі паміраць бацькі, усё гэтак
застаецца ад пачатку стварэньня».
5 Бо ад тых, якія хочуць гэтак [думаць], утоена, што нябёсы былі здаўна, і зямля з вады і праз
ваду паўстала праз Слова Божае.
6 Дзеля гэтага тагачасны сьвет загінуў, затоплены вадою,
7 а цяперашнія неба і зямля, якія ўтрымліваюцца словам Ягоным, захоўваюцца для агню на
дзень суду і загубы людзей бязбожных.
8 І тое ня можа быць утоена ад вас, улюбёныя, што ў Госпада адзін дзень — як тысяча гадоў, і
тысяча гадоў — як адзін дзень.
9 Не марудзіць Госпад з абяцаньнем, як гэта некаторыя за маруднасьць уважаюць, але Ён
доўгацярплівы да нас, не жадаючы некага загубіць, але каб усіх прывесьці да навяртаньня.

10 Прыйдзе ж дзень Госпада, як злодзей уначы, і тады нябёсы з вялікім шумам прамінуць, а
распаленыя стыхіі будуць разбурацца, і зямля, і справы, што на ёй, будуць спаленыя.
11 Калі так усё гэтае разбурыцца, якімі мусіце быць у сьвятым ладзе жыцьця і пабожнасьці вы,
12 якія чакаеце і сьпяшаецеся [бачыць] прыйсьце дня Божага, калі нябёсы, палымнеючы,
разбурацца, і распаленыя стыхіі растопяцца?
13 А мы, паводле Ягонага абяцаньня, чакаем новага неба і новае зямлі, на якіх праведнасьць
жыве.
14 Дзеля гэтага, улюбёныя, чакаючы гэтага, намагайцеся, каб Ён знайшоў вас у супакоі,
неапаганенымі і беззаганнымі.
15 І доўгацярплівасьць Госпада нашага ўважайце за збаўленьне, як і ўлюбёны брат наш Павал,
паводле дадзенай яму мудрасьці, напісаў вам,
16 як ён кажа пра гэта ў-ва ўсіх пасланьнях, у якіх ёсьць нешта складанае да разуменьня, што
невукі і неўгрунтаваныя на ўласную сваю загубу перакручваюць, як і іншыя Пісаньні.
17 Дык вы, улюбёныя, ведаючы [гэта] раней, сьцеражыцеся, каб, захапіўшыся падманам
беззаконьнікаў, вы не адпалі ад свайго ўмацаваньня,
18 і ўзрастайце ў ласцы і веданьні Госпада нашага і Збаўцы Ісуса Хрыста. Яму слава і цяпер, і ў
дзень вечны. Амэн.

ПЕРШАЕ ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ЯНА

1 Што было ад пачатку, што мы чулі, што бачылі вачыма нашымі, што разглядалі і да чаго
дакраналіся рукі нашыя, пра Слова жыцьця.
2 І жыцьцё зьявілася, і мы бачылі, і сьведчым, і абвяшчаем вам гэтае жыцьцё вечнае, якое было
ў Айца і зьявілася нам.
3 Што мы бачылі і чулі, абвяшчаем вам, каб і вы мелі супольнасьць з намі; а нашая
супольнасьць — з Айцом і Сынам Яго Ісусам Хрыстом.
4 І гэтае пішам вам, каб радасьць вашая была поўная.
5 І вось тое абяцаньне, якое мы чулі ад Яго і абвяшчаем вам, — Бог ёсьць сьвятло, і няма ў Ім
аніякае цемры.
6 Калі мы кажам, што маем супольнасьць з Ім, і ходзім у цемры, хлусім і ня робім праўды.
7 А калі ходзім у сьвятле, як Ён у сьвятле, маем супольнасьць між сабою, і кроў Ісуса Хрыста,
Сына Ягонага, ачышчае нас ад усякага грэху.
8 Калі кажам, што ня маем грэху, падманваем саміх сябе, і праўды няма ў нас.
9 Калі вызнаем грахі нашыя, Ён верны і праведны, каб даравацъ нам грахі і ачысьціць нас ад
усякае няправеднасьці.
10 Калі кажам, што мы не грашым, робім хлусам Яго, і слова Ягонага няма ў нас.

1 Ян 2

1 Дзеткі мае! Пішу вам гэтае, каб вы не грашылі, а калі хто зграшыў, маем Абаронцу перад
Айцом, Ісуса Хрыста, Праведніка.
2 Ён ёсьць перамольваньне за грахі нашыя, і ня толькі за нашыя, але і за [грахі] ўсяго сьвету.
3 І што мы пазналі Яго, даведваемся з таго, што захоўваем прыказаньні Ягоныя.
4 Хто кажа: «Я пазнаў Яго», і прыказаньні Ягоныя не захоўвае, той хлус, і няма ў ім праўды;
5 а хто захоўвае слова Ягонае, у тым сапраўды любоў Божая завяршылася. З гэтага
даведваемся, што мы ў Ім.
6 Хто кажа, што ў Ім застаецца, павінен хадзіць так, як Ён хадзіў.
7 Браты! Ня новае прыказаньне пішу вам, але прыказаньне старое, якое вы мелі ад пачатку.
Прыказаньне старое ёсьць слова, якое вы чулі ад пачатку.
8 Зноў жа новае прыказаньне пішу вам, якое праўдзіва ў Ім і ў вас, што цемра праходзіць, і
праўдзівае сьвятло ўжо сьвеціць.
9 Хто кажа, што ён у сьвятле, і ненавідзіць брата свайго, той у цемры дагэтуль.
10 Хто любіць брата свайго, застаецца ў сьвятле, і няма ў ім згаршэньня.
11 А хто ненавідзіць брата свайго, той ёсьць у цемры, і ў цемры ходзіць, і ня ведае, куды ідзе,
таму што цемра засьляпіла вочы яму.
12 Пішу вам, дзеткі, што адпушчаны вам грахі дзеля імя Яго.
13 Пішу вам, бацькі, што вы пазналі Таго, Які ад пачатку. Пішу вам, юнакі, што вы перамаглі
злога. Пішу вам, дзеці, што вы пазналі Айца.
14 Я напісаў вам, бацькі, што вы пазналі Таго, Які ад пачатку. Я напісаў вам, юнакі, што вы
дужыя, і слова Божае застаецца ў вас, і вы перамаглі злога.
15 Не любіце сьвету, ані таго, што ў сьвеце. Хто любіць сьвет, у тым няма любові Айца.
16 Бо ўсё, што ў сьвеце: пажаданьне цела, і пажаданьне вачэй, і пыха жыцьцёвая, — ня ёсьць
ад Айца, але ад сьвету.
17 І сьвет праходзіць, і пажаданьне ягонае, а хто чыніць волю Божую, застаецца на вякі.
18 Дзеці! Апошняя гадзіна! І як вы чулі, што прыйдзе антыхрыст, і цяпер зьявілася шмат
антыхрыстаў, дык мы даведваемся з гэтага, што апошняя гадзіна.
19 Яны выйшлі ад нас, але не былі ад нас; бо, калі б яны былі ад нас, засталіся б з намі; але
[выйшлі], каб выявілася, што ня ўсе ад нас.
20 І вы маеце памазаньне ад Сьвятога, і ведаеце ўсё.

21 Я напісаў вам не таму, што вы ня ведаеце праўды, але таму, што вы ведаеце яе, і што ніякай
хлусьні няма ад праўды.
22 Хто хлус, калі ня той, хто адракаецца, што Ісус ёсьць Хрыстос? Гэта — антыхрыст, які
адракаецца Айца і Сына.
23 Усякі, хто адракаецца Сына, ня мае і Айца; хто вызнае Сына, мае і Айца.
24 Дык што вы чулі ад пачатку, тое няхай застаецца ў вас. Калі застанецца ў вас тое, што вы
чулі ад пачатку, вы застанецеся і ў Сыне, і ў Айцу.
25 І гэтае абяцаньне, якое Ён абяцаў нам, ёсьць жыцьцё вечнае.
26 Гэта я напісаў вам пра тых, якія падманваюць вас.
27 І памазаньне, якое вы атрымалі ад Яго, у вас застаецца, і вы ня маеце патрэбы, каб хто вучыў
вас; але як гэтае самае памазаньне вучыць вас пра ўсё, і яно праўдзівае і не манлівае, дык, як
яно навучыла вас, у тым заставайцеся.
28 І цяпер, дзеткі, заставайцеся ў Ім, каб, калі Ён зьявіцца, мець нам адвагу і не асароміцца
перад Ім у прыход Ягоны.
29 Калі вы ведаеце, што Ён праведны, ведайце, што ўсякі, хто чыніць праведнасьць, ад Яго
народжаны.

1 Ян 3

1 Глядзіце, якую любоў даў нам Айцец, каб нам называцца дзецьмі Божымі. Сьвет дзеля таго
не пазнае вас, што не пазнаў Яго.
2 Улюбёныя! Мы цяпер дзеці Божыя, і яшчэ ня выявілася, што мы будзем, а ведаем, што, калі
выявіцца, будзем падобныя да Яго, бо ўгледзім Яго, як Ён ёсьць.
3 І ўсякі, хто мае гэтую надзею на Яго, ачышчае сябе, бо Ён чысты.
4 Усякі, хто робіць грэх, робіць і беззаконьне, і грэх ёсьць беззаконьне.
5 І вы ведаеце, што Ён зьявіўся, каб узяць грахі нашыя, і што ў Ім няма грэху.
6 Усякі, хто ў Ім застаецца, не грашыць; усякі, хто грашыць, ня бачыў Яго і не пазнаў Яго.
7 Дзеткі! Няхай ніхто вас не падмане. Хто чыніць праведнасьць, той праведны, як і Ён
праведны.
8 Хто чыніць грэх, той ад д’ябла, бо ад пачатку д’ябал грашыць. Дзеля гэтага і зьявіўся Сын
Божы, каб зьнішчыць справы д’ябла.
9 Усякі, хто народжаны ад Бога, грэху ня робіць, таму што насеньне Ягонае застаецца ў ім, і ён
ня можа грашыць, бо народжаны ад Бога.
10 Дзеці Божыя і дзеці д'яблавы выяўляюцца гэтак: усякі, хто ня робіць праведнасьць, ня ёсьць
ад Бога, і той, хто ня любіць брата свайго.
11 Бо гэткая ёсьць вестка, якую вы чулі ад пачатку, каб мы любілі адзін аднаго.
12 Ня гэтак, як Каін, што быў ад злога і замардаваў брата свайго. І дзеля чаго замардаваў яго?
Бо ягоныя ўчынкі былі злыя, а брата ягонага — праведныя.
13 Не зьдзіўляйцеся, браты мае, калі сьвет ненавідзіць вас.
14 Мы ведаем, што перайшлі ад сьмерці ў жыцьцё, бо любім братоў; хто ня любіць брата,
застаецца ў сьмерці.
15 Усякі, хто ненавідзіць брата свайго, ёсьць чалавеказабойца; і вы ведаеце, што ніводзін
чалавеказабойца ня мае жыцьця вечнага, якое ў ім застаецца.
16 У гэтым пазналі мы любоў, што Ён паклаў за нас душу Сваю; і мы павінны пакладаць душы
свае за братоў.
17 А хто мае маёмасьць у сьвеце, і бачыць брата свайго ў патрэбе, і зачыняе ад яго нутро сваё,
дык як любоў Божая застаецца ў ім?
18 Дзеткі мае! Будзем любіць ня словам ці языком, але ўчынкам і праўдаю!
19 І з гэтага даведаемся, што мы ад праўды, і супакоім перад Ім сэрцы нашыя.
20 Бо калі сэрца нас дакарае, дык Бог большы за сэрца нашае і ведае ўсё.
21 Улюбёныя! Калі сэрца нашае не дакарае нас, мы маем адвагу перад Богам,

22 і чаго ні папросім, атрымаем ад Яго, бо захоўваем прыказаньні Ягоныя і тое, што падабаецца
[Яму], робім перад Ім.
23 І гэткае прыказаньне Яго, каб мы верылі ў імя Сына Ягонага Ісуса Хрыста і любілі адзін
аднаго, як Ён даў нам прыказаньне.
24 І хто захоўвае прыказаньні Ягоныя, той застаецца ў Ім, і Ён у тым. І што Ён застаецца ў нас,
даведваемся паводле Духа, Якога Ён нам даў.

1 Ян 4

1 Улюбёныя! Ня ўсякаму духу верце, але выпрабоўвайце духаў, ці ад Бога яны, бо шмат
фальшывых прарокаў прыйшло ў сьвет.
2 З гэтага вы пазнаеце Духа Божага: усякі дух, які вызнае Ісуса Хрыста, Які прыйшоў у целе,
ёсьць ад Бога,
3 а ўсякі дух, які не вызнае Ісуса Хрыста, Які прыйшоў у целе, ня ёсьць ад Бога, і гэта [дух]
антыхрыста, пра якога вы чулі, што ён прыйдзе, і цяпер ёсьць ужо ў сьвеце.
4 Дзеткі! Вы — ад Бога, і вы перамаглі іх, бо Той, Які ў вас, большы за таго, які ў сьвеце.
5 Яны — ад сьвету, дзеля гэтага гавораць ад сьвету, і сьвет слухае іх.
6 Мы — ад Бога. Хто ведае Бога, той слухае нас; хто не ад Бога, той ня слухае нас. З гэтага мы
пазнаем духа праўды і духа падману.
7 Улюбёныя! Будзем любіць адзін аднаго, бо любоў — ад Бога, і кожны, хто любіць, народжаны
ад Бога і ведае Бога.
8 Хто ня любіць, той не пазнаў Бога, бо Бог ёсьць любоў.
9 У гэтым выявілася любоў Божая да нас, што Бог паслаў у сьвет Сына Свайго Адзінароднага,
каб мы жылі праз Яго.
10 У гэтым любоў, што ня мы палюбілі Бога, але што Ён палюбіў нас і паслаў Сына Свайго як
перамольваньне за грахі нашыя.
11 Улюбёныя! Калі Бог гэтак палюбіў нас, і мы павінны любіць адзін аднаго.
12 Бога ніхто ніколі ня бачыў. Калі мы любім адзін аднаго, Бог у нас застаецца, і любоў Ягоная
дасканалая ў нас.
13 З гэтага мы пазнаем, што мы застаемся ў Ім, і Ён — у нас, што Ён даў нам ад Духа Свайго.
14 І мы бачылі і сьведчым, што Айцец паслаў Сына як Збаўцу сьвету.
15 Хто вызнае, што Ісус ёсьць Сын Божы, у тым застаецца Бог, і ён — у Богу.
16 І мы пазналі і паверылі ў любоў, якую мае да нас Бог. Бог ёсьць любоў, і хто застаецца ў
любові, застаецца ў Богу, і Бог — у ім.
17 Дзеля гэтага дасканаліцца любоў сярод нас, каб мы мелі адвагу ў дзень суду, бо які Ён, гэткія
і мы ў сьвеце гэтым.
18 Страху няма ў любові, але дасканалая любоў прэч выганяе страх, бо ў страху ёсьць
мучэньне; а хто баіцца, той у любові недасканалы.
19 Мы любім Яго, бо Ён першы палюбіў нас.
20 Калі хто кажа: «Я люблю Бога», і брата свайго ненавідзіць, той хлус, бо хто ня любіць брата
свайго, якога бачыць, як можа любіць Бога, Якога ня бачыць?
21 І мы маем ад Яго гэткае прыказаньне, каб той, хто любіць Бога, любіў і брата свайго.

1 Ян 5

1 Кожны, хто верыць, што Ісус ёсьць Хрыстос, ад Бога народжаны, і кожны, хто любіць Таго,
Які нарадзіў, любіць і Народжанага ад Яго.
2 З гэтага пазнаем, што любім дзяцей Божых, калі любім Бога і захоўваем прыказаньні Ягоныя.
3 Бо тое ёсьць любоў Божая, каб мы захоўвалі прыказаньні Ягоныя; і прыказаньні Ягоныя
няцяжкія.
4 Бо кожны, хто народжаны ад Бога, перамагае сьвет; і гэтая перамога, што перамагла сьвет,
— вера нашая.
5 Хто той, які перамагае сьвет, калі ня той, які верыць, што Ісус ёсьць Сын Божы?

6 Гэты Ісус Хрыстос, Які прыйшоў праз ваду і кроў; не праз ваду толькі, але праз ваду і кроў; і
Дух ёсьць Тым, Які сьведчыць, бо Дух ёсьць праўда.
7 Бо тры сьведчаць у небе: Айцец, Слова і Сьвяты Дух, — і гэтыя тры ёсьць адно.
8 І тры сьведчаць на зямлі: дух, вада і кроў; і гэтыя тры — пра адно.
9 Калі мы прыймаем сьведчаньне чалавечае, сьведчаньне Божае большае, бо гэта ёсьць
сьведчаньне Божае, якім Ён засьведчыў пра Сына Свайго.
10 Хто верыць у Сына Божага, мае сьведчаньне ў сабе; хто ня верыць Богу, зрабіў Яго хлусам,
бо не паверыў у сьведчаньне, якім Бог засьведчыў пра Сына Свайго.
11 І гэткае ёсьць сьведчаньне, што Бог даў нам жыцьцё вечнае, і гэтае жыцьцё — у Сыне Ягоным.
12 Хто мае Сына, мае жыцьцё; хто Сына Божага ня мае, ня мае жыцьця.
13 Гэтае напісаў я вам, якія вераць у імя Сына Божага, каб вы ведалі, што маеце жыцьцё вечнае,
і каб вы верылі ў імя Сына Божага.
14 І вось адвага, якую мы маем дзеля Яго, што калі нешта просім паводле волі Яго, Ён слухае
нас.
15 І калі мы ведаем, што Ён слухае нас, чаго б мы ні прасілі, ведаем, што маем прошанае, якое
прасілі ў Яго.
16 Калі хто ўбачыў брата свайго, які грашыць грэхам не на сьмерць, няхай просіць [за яго], і
[Бог] дасьць жыцьцё таму, які грашыць не на сьмерць. Ёсьць грэх на сьмерць, не кажу, каб
адносна такога ён маліўся.
17 Усякая няправеднасьць ёсьць грэх, але ёсьць грэх не на сьмерць.
18 Мы ведаем, што кожны, народжаны ад Бога, не грашыць; але народжаны ад Бога захоўвае
сябе, і злы не дакранецца яго.
19 Мы ведаем, што мы — ад Бога, і ўвесь сьвет ляжыць у зьле.
20 Ведаем жа, што Сын Божы прыйшоў і даў нам разуменьне, каб пазналі Праўдзівага і былі ў
Праўдзівым — у Сыне Ягоным Ісусе Хрысьце. Ён ёсьць праўдзівы Бог і жыцьцё вечнае.
21 Дзеткі! Захоўвайце сябе ад ідалаў. Амэн.

ДРУГОЕ ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ЯНА

1 Староста — выбранай пані і дзецям яе, якіх я люблю ў праўдзе, і ня я адзін, але і ўсе, што
пазналі праўду,
2 дзеля праўды, якая застаецца ў нас і будзе з намі на вякі.
3 Няхай будзе з вамі ласка, міласэрнасьць, супакой ад Бога Айца і ад Госпада Ісуса Хрыста,
Сына Айца, у праўдзе і любові!
4 Я вельмі ўзрадаваўся, што знайшоў сярод дзяцей тваіх тых, якія ходзяць у праўдзе, як мы
атрымалі прыказаньне ад Айца.
5 І цяпер прашу цябе, пані, не як новае прыказаньне пішучы табе, але тое, якое маем ад
пачатку, — каб мы любілі адзін аднаго.
6 І гэта ёсьць любоў, каб мы хадзілі паводле прыказаньняў Ягоных. Гэта ёсьць прыказаньне,
якое вы чулі ад пачатку, каб у ім вы хадзілі.
7 Бо шмат падманшчыкаў увайшло ў гэты сьвет, якія не вызнаюць Ісуса Хрыста, Які прыйшоў
у целе. Гэткі ёсьць падманшчык і антыхрыст.
8 Глядзіце за сабою, каб нам не згубіць таго, над чым мы працавалі, але каб атрымаць поўную
нагароду.
9 Кожны, хто адступаецца і не застаецца ў вучэньні Хрыстовым, ня мае Бога; а хто застаецца ў
вучэньні Хрыстовым, той мае і Айца, і Сына.
10 Калі хто прыходзіць да вас і не прыносіць гэтага вучэньня, таго не прыймайце ў дом і
радавацца яму не кажыце,
11 бо хто кажа радавацца яму, той супольнічае ў злых учынках ягоных.
12 Шмат маю пісаць да вас, але не хачу на паперы і атрамантам, але спадзяюся прыйсьці да вас
і гаварыць вуснамі ў вусны, каб радасьць вашая споўнілася.
13 Вітаюць цябе дзеці сястры твае выбранае. Амэн.

ТРЭЦЯЕ ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ЯНА

1 Староста — улюбёнаму Гаю, якога я люблю ў праўдзе.
2 Улюбёны! Малюся, каб ты быў здаровы і пасьпяховы ў-ва ўсім, як пасьпяховая душа твая.
3 Бо я вельмі ўзрадаваўся, калі прыйшлі браты і засьведчылі пра тваю праўду, як ты ходзіш у праўдзе.
4 Для мяне няма большай радасьці, як чуць, што дзеці мае ходзяць у праўдзе.
5 Улюбёны! Ты робіш вернае ў тым, што робіш для братоў і для чужынцаў,
6 якія засьведчылі перад царквою пра тваю любоў. Ты добра зробіш, правёўшы іх, як належыцца перад Богам,
7 бо яны дзеля імя Ягонага пайшлі, нічога ня ўзяўшы ад паганаў.
8 А мы павінны прыймаць гэтакіх, каб стацца супрацоўнікамі праўдзе.
9 Я пісаў царкве, але Дыятрэф, які любіць у іх быць першым, не прызнае нас.
10 Дзеля гэтага, калі я прыйду, нагадаю пра ўчынкі ягоныя, якія ён робіць, абмаўляючы нас злымі словамі; і не задавольваючыся гэтым, і сам не прызнае братоў, і тым, якія хочуць, забараняе, і выганяе з царквы.
11 Улюбёны! Не пераймай ліхое, але добрае. Хто робіць дабро, той ад Бога; а хто робіць ліхое, ня бачыў Бога.
12 Пра Дэмэтрыя засьведчана ўсімі і самой праўдаю, і мы сьведчым, і вы ведаеце, што сьведчаньне нашае праўдзівае.
13 Шмат меў я пісаць, але не хачу пісаць табе атрамантам і трысьцінай,
14 а спадзяюся неўзабаве пабачыць цябе і гаварыць вуснамі ў вусны.
15 Супакой табе! Вітаюць цябе сябры; прывітай сяброў паіменна.

ПАЎСЮДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ АПОСТАЛА ЮДЫ

1 Юда, слуга Ісуса Хрыста, брат Якуба, — пакліканым, якія асьвечаныя Богам Айцом і
захаваныя Ісусам Хрыстом:
2 літасьць вам, і супакой, і любоў няхай памножацца!
3 Улюбёныя! Прыкладаючы ўсякую дбайнасьць, каб пісаць вам пра агульнае збаўленьне,
я палічыў за патрэбнае напісаць вам напамін — змагацца за веру, аднойчы перададзеную
сьвятым.
4 Бо паўбіваліся некаторыя людзі, здаўна прызначаныя на гэтае асуджэньне, бязбожнікі, якія
ласку Бога нашага на распусту абяртаюць і адзінага Валадара, Бога і Госпада нашага Ісуса
Хрыста, выракаюцца.
5 Я хачу нагадаць вам, якія аднойчы гэта даведаліся, што Госпад, вызваліўшы народ з зямлі
Эгіпецкае, тых, што не паверылі, пасьля загубіў,
6 і анёлаў, якія не захавалі свае ўлады, але пакінулі сваё жытло, у вечных путах пад цемраю на
суд вялікага дня трымае.
7 Як Садом і Гамора і вакалічныя гарады, якія падобна да іх жылі ў распусьце і за іншым целам
хадзілі, падпаўшы пад кару вечнага агню, пастаўленыя за прыклад, —
8 гэтаксама будзе і з гэтымі летуценьнікамі, якія апаганьваюць цела, адкідаюць панаваньне і
блюзьняць супраць славы.
9 Міхал арханёл, калі гаварыў з д'яблам, спрачаючыся за цела Майсея, не адважыўся вынесьці
блюзьнерскага прысуду, але сказаў: «Няхай забароніць табе Госпад».
10 А гэтыя блюзьняць супраць таго, чаго ня ведаюць; а што паводле прыроды ведаюць, як
бязмоўныя жывёлы, тым сябе зьнішчаюць.
11 Гора ім, бо яны пайшлі шляхам Каіна, паддаліся падману нагароды Білеама, і ва ўпартасьці
загінулі, як Карах.
12 Яны — небясьпека на вашых вячэрах любові; банкетуючы з вамі, пасуцца бяз страху; гэта
хмары бязводныя, якія ветрам носяцца; восеньскія дрэвы, бясплодныя, двойчы памёршыя, з
корнем павырываныя;
13 лютыя хвалі марскія, якія пеняцца сорамам сваім; зоркі, што блукаюць, для якіх змрок
цемры навекі захаваны.
14 Пра іх прарочыў і Энох, сёмы ад Адама, кажучы: «Вось, ідзе Госпад з дзясяткамі тысячаў
сьвятых Сваіх,
15 [каб] учыніць суд над усімі і дакарыць усіх бязбожнікаў іхніх за ўсе ўчынкі бязбожнасьці іх,
якімі бязбожнае чынілі, і за ўсе жорсткасьці, што гаварылі на Яго бязбожныя грэшнікі».
16 Гэта наракальнікі, якія нічым не задавальняюцца, якія ходзяць паводле пажаданьняў сваіх;
і вусны іхнія гавораць пыхліва, і яны зважаюць на аблічча дзеля карысьці.
17 Але вы, улюбёныя, памятайце словы, раней сказаныя апосталамі Госпада нашага Ісуса
Хрыста:
18 яны казалі вам, што ў апошні час зьявяцца лаяльнікі, якія ходзяць паводле сваіх бязбожных
пажаданьняў.
19 Гэта тыя, якія адлучаюць сябе ад іншых, душэўныя, але ня маюць духа.
20 А вы, улюбёныя, будуючы сябе найсьвяцейшай верай вашаю, молячыся ў Духу Сьвятым,
21 захоўвайце сябе ў любові Божай, чакаючы ласкі ад Госпада нашага Ісуса Хрыста ў жыцьцё
вечнае.
22 І над аднымі літуйцеся з развагаю,
23 а другіх ратуйце, выхопліваючы з агню, дакарайце са страхам, ненавідзячы нават вопратку,
целам апаганеную.
24 А Таму, Які можа захаваць вас ад упадку і паставіць перад славаю Сваёю беззаганнымі і ў
радасьці,
25 адзінаму мудраму Богу, Збаўцу нашаму, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага, слава і веліч,
сіла і ўлада цяпер і на ўсе вякі. Амэн.

АДКРЫЦЬЦЁ ЯНА БАГАСЛОВА

1 Адкрыцьцё Ісуса Хрыста, якое даў Яму Бог, каб паказаў слугам Сваім, што мусіць стацца
неўзабаве. І Ён даў знак, паслаўшы [яго] праз анёла Свайго слузе Свайму Яну,
2 які засьведчыў слова Божае, і сьведчаньне Ісуса Хрыста, і ўсё, што бачыў.
3 Шчасьлівы той, які чытае, і тыя, якія слухаюць словы прароцтва і захоўваюць тое, што
напісана ў ім, бо час блізкі.
4 Ян — да сямі цэркваў, што ў Азіі: ласка вам і супакой ад Таго, Які ёсьць, і Які быў, і Які
прыходзіць, і ад сямі духаў, якія перад пасадам Ягоным,
5 і ад Ісуса Хрыста, сьведкі вернага, Першароднага з мёртвых і Начальніка валадароў зямных.
Яму, Які палюбіў нас і ў крыві Сваёй абмыў нас ад грахоў нашых,
6 і зрабіў нас валадарамі і сьвятарамі Богу і Айцу Свайму, слава і ўлада на вякі вякоў. Амэн.
7 Вось, Ён прыходзіць з аблокамі, і ўгледзіць Яго кожнае вока і тыя, якія прабілі Яго, і заплачуць
перад Ім усе плямёны зямлі. Так, амэн.
8 «Я ёсьць Альфа і Амэга, Пачатак і Канец, — кажа Госпад, — Які ёсьць, і Які быў, і Які прыходзіць,
Усеўладны».
9 Я, Ян, брат ваш і ўдзельнік у прыгнёце, і ў Валадарстве, і ў цярплівасьці Ісуса Хрыста, быў на
востраве, называным Патмас, за слова Божае і за сьведчаньне Ісуса Хрыста.
10 Я быў у духу ў дзень Госпада і пачуў за сабою вялікі голас, як трубы,
11 які казаў: «Я ёсьць Альфа і Амэга, Першы і Апошні; і што бачыш, напішы ў кнігу і пашлі
цэрквам, што ў Азіі: у Эфэс, і ў Сьмірну, і ў Пэргам, і ў Тыятыру, і ў Сарды, і ў Філядэльфію, і ў
Ляадыкею».
12 І я павярнуўся, каб пабачыць той голас, што гаварыў са мною, і, павярнуўшыся, убачыў сем
залатых сьвечнікаў,
13 і сярод сямі сьвечнікаў — Падобнага да Сына Чалавечага, Які апрануты ў доўгую шату і
падперазаны праз грудзі залатым паясом.
14 А галава Ягоная і валасы белыя, як белая воўна, як сьнег; і вочы Ягоныя — як полымя агню,
15 і ногі Ягоныя падобныя да халкалібану, як у печы распаленыя; і голас Ягоны — як гук водаў
многіх.
16 І меў Ён у правай руцэ Сваёй сем зорак, і з вуснаў Ягоных выходзіў меч двусечны востры; і
твар Ягоны — як сонца, якое сьвеціць у сіле сваёй.
17 І калі я ўбачыў Яго, я ўпаў ля ног Ягоных як мёртвы, і Ён паклаў на мяне правую руку Сваю,
кажучы мне: «Ня бойся. Я ёсьць Першы і Апошні,
18 і Жывы, і Я быў мёртвы, і вось, жыву на вякі вякоў, амэн. І Я маю ключы пекла і сьмерці.
19 Напішы, што ты бачыў, і што ёсьць, і што мае стацца пасьля гэтага.
20 Тайна сямі зорак, якія ты бачыў у правіцы Маёй, і сямі сьвечнікаў залатых: сем зорак — гэта
анёлы сямі цэркваў, а сем сьвечнікаў, якія ты бачыў, — гэта сем цэркваў.

Адкр 2

1 Анёлу Эфэскае царквы напішы: “Гэта кажа Той, Які трымае сем зорак у правіцы Сваёй і Які
ходзіць сярод сямі залатых сьвечнікаў:
2 ‘Ведаю справы твае, і працу тваю, і цярплівасьць тваю, і што ня можаш пераносіць ліхіх, і
дасьведчыў тых, якія называюць сябе апосталамі і ня ёсьць [імі], і знайшоў, што яны хлусы,
3 і ты перанёс, і маеш цярплівасьць, і дзеля імя Майго працаваў і не зьнямогся.
4 Але маю супраць цябе, што ты пакінуў першую любоў тваю.
5 Дык памятай, адкуль выпаў, і навярніся, і рабі першыя справы твае; а калі не, хутка прыйду
да цябе і зрушу сьвечнік твой з месца ягонага, калі не навернешся.
6 Але тое ты маеш, што ненавідзіш справы Мікалаітаў, якія і Я ненавіджу’.

7 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам. Таму, хто пераможа, Я дам есьці ад дрэва
жыцьця, што пасярод раю Божага”.
8 І анёлу Сьмірнскае царквы напішы: “Гэта кажа Першы і Апошні, Які быў мёртвы і ажыў:
9 ‘Ведаю справы твае, і прыгнёт, і ўбоства, хоць ты багаты, і блюзьнерствы ад тых, якія
называюць сябе Юдэямі і ня ёсьць, але ёсьць сынагога шатана.
10 Не палохайся нічога, што маеш выцярпець. Вось, д’ябал мае кідаць [некаторых] з вас у
вязьніцу, каб спакусіць вас; і будзеце мець прыгнёт дзесяць дзён. Будзь верны да сьмерці, і
Я дам табе вянок жыцьця’.
11 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам. Той, хто пераможа, не дазнае крыўды
ад сьмерці другое”.
12 І анёлу царквы, што ў Пэргаме, напішы: “Гэта кажа Той, Які мае меч двусечны востры:
13 ‘Ведаю справы твае, і што жывеш там, дзе пасад шатана, і трымаеш імя Маё, і не адрокся
веры Маёй у тыя дні, калі ў вас, дзе пасяліўся шатан, быў забіты Антыпа, сьведка Мой верны.
14 Але маю супраць цябе крыху, бо маеш там тых, якія трымаюцца вучэньня Білеама, які
навучыў Балака кінуць згаршэньне перад сынамі Ізраіля, каб яны елі ахвяры ідалам і жылі
распусна.
15 Таксама маеш і ты тых, якія трымаюцца вучэньня Мікалаітаў, якое Я ненавіджу.
16 Навярніся, а калі не, хутка прыйду да цябе і буду ваяваць з імі мячом вуснаў Маіх’.
17 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам. Таму, хто пераможа, Я дам есьці ад
манны схаванае і дам яму каменьчык белы, і на каменьчыку імя новае напісанае, якога ніхто
ня ведае, толькі той, хто атрымаў”.
18 І анёлу царквы, што ў Тыятыры, напішы: “Гэта кажа Сын Божы, Які мае вочы Свае, як полымя
агню, і ногі Свае, падобныя да сьпіжу:
19 ‘Ведаю справы твае і любоў, і служэньне, і веру, і цярплівасьць тваю, і ўчынкі твае, і што
апошнія большыя, чым першыя.
20 Але маю супраць цябе крыху, бо ты дазваляеш жанчыне Езабэлі, якая называе сябе
прарочыцай, вучыць і падманваць слугаў Маіх, [каб яны] жылі распусна і елі ахвяры ідалам.
21 І Я даў ёй час, каб навярнулася ад распусты сваёй, і яна не навярнулася.
22 Вось, Я кідаю на ложак яе і тых, якія чужаложаць з ёю, — у вялікі прыгнёт, калі не навернуцца
ад справаў сваіх,
23 і дзяцей ейных сьмерцю заб’ю, і даведаюцца ўсе цэрквы, што Я — Той, Які дасьледуе ныркі і
сэрца, і Я дам вам кожнаму паводле справаў вашых.
24 Вам жа кажу і рэшце, што ў Тыятыры, усім, якія ня маюць гэтага вучэньня і якія не
даведаліся так званых глыбіняў шатана: “Ня ўскіну на вас іншага цяжару.
25 Толькі тое, што маеце, трымайце, пакуль не прыйду”.
26 І таму, хто пераможа і захавае справы Мае да канца, Я дам уладу над паганамі,
27 і ён будзе пасьвіць іх кіем жалезным; як начыньне глінянае, яны будуць скрышаныя, як і Я
атрымаў ад Айца Майго,
28 і дам яму зорку ранішнюю’.
29 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам”.

Адкр 3

1 І анёлу царквы, што ў Сардах, напішы: “Гэта кажа Той, Які мае сем духаў Божых і сем зорак:
‘Ведаю справы твае, што ты маеш імя, што жывеш, ды ёсьць мёртвы.
2 Чувай і ўмацоўвай іншых, якія маюць паміраць, бо не знайшоў Я, каб справы твае былі
споўненыя перад Богам.
3 Дык памятай, што ты атрымаў і пачуў, і захоўвай, і навярніся. А калі ня будзеш чуваць, Я
прыйду да цябе, як злодзей, і ты ня будзеш ведаць, у якую гадзіну прыйду да цябе.
4 Ты маеш у Сардах некалькі імёнаў, якія не апаганілі адзеньня свайго, і яны будуць хадзіць са
Мною ў белым, бо яны дастойныя.

5 Той, хто пераможа, будзе апрануты ў белыя шаты; і Я ня вытру імя ягонага з кнігі жыцьця, і
вызнаю імя ягонае перад Айцом Маім і перад анёламі Ягонымі’.
6 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам”.
7 І анёлу царквы, што ў Філядэльфіі, напішы: “Гэта кажа Сьвяты, Праўдзівы, Які мае ключ
Давідавы, Які адчыняе, і ніхто не замкне, і замыкае, і ніхто не адчыніць:
8 ‘Ведаю справы твае. Вось, Я даў перад табою дзьверы адчыненыя, і ніхто ня можа замкнуць
іх, бо ты маеш малую сілу, і захаваў слова Маё, і не адрокся ад імя Майго.
9 Вось, Я даю, што з сынагогі шатана, з тых, якія называюць сябе Юдэямі, ды ня ёсьць, але
хлусяць, вось, Я зраблю, каб яны прыйшлі, і пакланіліся перад нагамі тваімі, і даведаліся, што
Я палюбіў цябе.
10 А што ты захаваў слова цярплівасьці Маёй, і Я захаваю цябе ад гадзіны спакусы, якая мае
прыйсьці на ўвесь сусьвет, каб спакусіць жыхароў зямлі.
11 Вось, Я прыходжу хутка. Трымай тое, што маеш, каб ніхто не забраў вянка твайго.
12 Таго, хто пераможа, Я зраблю слупом у бажніцы Бога Майго, і ён ужо ня выйдзе вонкі; і
напішу на ім імя Бога Майго і імя горада Бога Майго, новага Ерусаліму, які зыходзіць з неба ад
Бога Майго, і імя Маё новае’.
13 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам”.
14 І анёлу Ляадыкейскае царквы напішы: “Гэта кажа Амэн, Сьведка верны і праўдзівы,
Начальнік стварэньня Божага:
15 ‘Ведаю справы твае, што ты ані халодны, ані гарачы; о, каб ты быў халодны або гарачы!
16 Дык дзеля таго, што ты цёплы, а не халодны і не гарачы, Я маю выплюнуць цябе з вуснаў
Маіх.
17 Бо ты кажаш: “Я багаты і ўзбагаціўся, і ня маю аніякае патрэбы”, і ня ведаеш, што ты —
гаротны, і жалю годны, і ўбогі, і сьляпы, і голы.
18 Раю табе купіць у Мяне золата, ачышчанае ў агні, каб ты ўзбагаціўся, і белыя шаты, каб
апрануўся, і каб ня выявіўся сорам галізны тваёй; і мазьзю для вачэй памаж вочы твае, каб ты
бачыў.
19 Я тых, каго люблю, дакараю і караю. Дык будзь руплівы і навярніся.
20 Вось, стаю пры дзьвярах і грукаюся; калі хто пачуе голас Мой і адчыніць дзьверы, Я ўвайду
да яго і буду вячэраць з ім, і ён — са Мною.
21 Таму, хто пераможа, Я дам сесьці са Мною на пасадзе Маім, як і Я перамог і сеў з Айцом Маім
на пасадзе Ягоным’.
22 Хто мае вуха, няхай слухае, што Дух кажа цэрквам”».

Адкр 4

1 Пасьля гэтага ўбачыў я, і вось, дзьверы адчыненыя ў небе, і першы голас, які я чуў, як трубы,
які гаварыў са мною, сказаў: «Узыйдзі сюды, і Я пакажу табе, што мусіць стацца пасьля гэтага».
2 І я адразу стаўся ў духу, і вось, пасад стаяў у небе, і на пасадзе — Той, Які сядзеў.
3 І Той, Які сядзеў, падобны быў з выгляду да камяня ясьпісовага і сардыновага, і вясёлка вакол
пасаду, з выгляду падобная да шмарагду.
4 І вакол пасаду — дваццаць чатыры пасады, і на пасадах я ўбачыў дваццаць чатыры старосты,
якія сядзелі, апранутыя ў белыя шаты, і на галовах яны мелі залатыя вянкі.
5 І з пасаду выходзяць маланкі, і грымоты, і галасы; і сем лямпаў агністых гараць перад
пасадам, якія ёсьць сем духаў Божых.
6 І перад пасадам — мора шкляное, падобнае да крышталю, і па сярэдзіне пасаду і вакол пасаду
— чатыры жывёлы, поўныя вачэй спераду і ззаду.
7 І першая жывёла падобная да ільва, і другая жывёла падобная да цяляці, і трэцяя жывёла
мела аблічча, як чалавек, і чацьвёртая жывёла падобная да арла, які ляціць.
8 І чатыры жывёлы, кожная па сабе, мелі па шэсьць крылаў наўкола, і ўсярэдзіне поўныя
вачэй; і ня маюць яны супачынку ўдзень і ўначы, кажучы: «Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты Госпад
Бог Усеўладны, Які быў, і Які ёсьць, і Які прыходзіць».

9 І калі жывёлы аддаюць славу, і пашану, і падзяку Таму, Які сядзіць на пасадзе, Які жыве на
вякі вякоў,
10 падаюць дваццаць чатыры старосты перад Тым, Які сядзіць на пасадзе, і пакланяюцца Таму,
Які жыве на вякі вякоў, і кідаюць свае вянкі перад пасадам, кажучы:
11 «Госпадзе, Ты годны атрымаць славу, і пашану, і моц, бо Ты стварыў усё, і воляй Тваёю яно
ёсьць і створана».

Адкр 5

1 І ўбачыў я ў правіцы Таго, Які сядзеў на пасадзе, кнігу, запісаную ўнутры і зьверху,
запячатаную сямю пячаткамі.
2 І ўбачыў я дужага анёла, які абвяшчаў голасам вялікім: «Хто годны разгарнуць кнігу і зьняць
пячаткі яе?»
3 І ніхто ня мог ані ў небе, ані на зямлі, ані пад зямлёй разгарнуць кнігу і паглядзець у яе.
4 І я шмат плакаў, што не знайшлося нікога, годнага разгарнуць і прачытаць кнігу ці
паглядзець у яе.
5 І адзін са старостаў кажа мне: «Ня плач! Вось, Леў, Які з калена Юды, корань Давіда, перамог,
каб разгарнуць кнігу і зьняць сем пячатак яе».
6 І я ўбачыў, і вось, пасярод пасаду і чатырох жывёлаў, і пасярод старостаў Ягня стаіць, быццам
забітае, Які мае сем рагоў і сем вачэй, што ёсьць сем духаў Божых, якія пасланыя на ўсю зямлю.
7 І Ён прыйшоў і ўзяў кнігу з правіцы Таго, Які сядзеў на пасадзе.
8 І калі ўзяў Ён кнігу, чатыры жывёлы і дваццаць чатыры старосты ўпалі прад Ягнём, маючы
кожны гусьлі і чары залатыя, поўныя фіміяму, які ёсьць малітвы сьвятых,
9 і сьпяваюць новы сьпеў, кажучы: «Ты годны ўзяць кнігу і адчыніць пячаткі яе, бо Ты быў
забіты, і Ты Крывёю Сваёю адкупіў нас Богу з кожнага калена, і мовы, і племені, і народу,
10 і зрабіў нас валадарамі і сьвятарамі Богу нашаму; і мы будзем валадарыць на зямлі».
11 І я ўбачыў і пачуў голас мноства анёлаў вакол пасаду, і жывёлаў, і старостаў; і лік іхні быў
дзясяткі тысячаў дзясяткаў тысячаў і тысячы тысячаў,
12 якія гаварылі голасам вялікім: «Годны Ягня забіты ўзяць моц, і багацьце, і мудрасьць, і
магутнасьць, і пашану, і славу, і дабраслаўленьне».
13 І ўсякае стварэньне, што ў небе, і на зямлі, і пад зямлёй, і ў моры, і ўсё, што ў іх, я чуў, як
казала: «Таму, Які сядзіць на пасадзе, і Ягняці — дабраслаўленьне, і пашана, і слава, і ўлада на
вякі вякоў».
14 І чатыры жывёлы казалі: «Амэн». І дваццаць чатыры старосты ўпалі і пакланіліся Таму, Які
жыве на вякі вякоў.

Адкр 6

1 І ўбачыў я, што Ягня адчыніў адну з пячатак, і я пачуў адну з чатырох жывёлаў, якая казала
быццам голасам грымотным: «Прыйдзі і глядзі».
2 І я ўбачыў, і вось, конь белы, і вершнік на ім, які мае лук; і дадзены яму вянок, і ён выйшаў,
перамагаючы, і каб перамагчы.
3 І калі Ён адчыніў другую пячатку, я пачуў другую жывёлу, якая казала: «Прыйдзі і глядзі».
4 І выйшаў іншы конь, чырвоны, і вершніку на ім дадзена забраць супакой з зямлі, і каб адны
адных забівалі; і дадзены яму меч вялікі.
5 І калі Ён адчыніў трэцюю пячатку, я пачуў трэцюю жывёлу, якая казала: «Прыйдзі і глядзі».
І я ўбачыў, і вось, конь чорны, і вершнік на ім, які меў шалі ў руцэ сваёй.
6 І пачуў я голас пасярод чатырох жывёлаў, які казаў: «Хінікс пшаніцы за дынар, і тры хініксы
ячменю за дынар; і алівы і віна не марнуй».
7 І калі Ён адчыніў чацьвёртую пячатку, я пачуў голас чацьвёртае жывёлы, які казаў: «Прыйдзі
і глядзі».

8 І я ўбачыў, і вось, конь бляды, і вершнік на ім, імя якому — Сьмерць, і пекла ідзе за ім; і
дадзена ім улада забіваць на чацьвёртай частцы зямлі мячом, і голадам, і сьмерцю, і зьвярамі
зямнымі.
9 І калі Ён адчыніў пятую пячатку, я ўбачыў пад ахвярнікам душы забітых за Слова Божае і за
сьведчаньне, якое яны мелі.
10 І закрычалі яны голасам вялікім, кажучы: «Дакуль, Уладару Сьвяты і Праўдзівы, ня судзіш
і ня помсьціш за кроў нашу жыхарам зямлі?»
11 І былі дадзены кожнаму вопраткі белыя, і сказалі ім, каб супакоіліся яшчэ крыху часу,
пакуль не дапоўняць [лік] таварышы іхнія і браты іхнія, што маюць быць забітыя, як і яны.
12 І ўбачыў я, калі Ён адчыніў шостую пячатку, і вось, стаўся вялікі землятрус, і сонца сталася
чорным, як мех валасяны, і месяц стаўся, як кроў,
13 і зоркі нябесныя ўпалі на зямлю, як дрэва фігавае, устрасанае вялікім ветрам, скідае
недасьпелыя фігі свае,
14 і неба зьнікла, як скручваецца кніга, і кожная гара і востраў былі зрушаны з месцаў сваіх.
15 І валадары зямныя, і магнаты, і багатыры, і тысячнікі, і магутныя, і кожны слуга, і кожны
свабодны схаваліся ў пячорах і ў горных скалах,
16 і кажуць горам і скалам: «Упадзіце на нас і схавайце нас ад аблічча Таго, Які сядзіць на
пасадзе, і ад гневу Ягняці,
17 бо прыйшоў вялікі дзень гневу Ягонага, і хто зможа ўстаяць?»

Адкр 7

1 І пасьля гэтага я ўбачыў чатырох анёлаў, якія стаялі на чатырох кутах зямлі і трымалі чатыры
вятры зямлі, каб ня дзьмуў вецер ані на зямлю, ані на мора, ані на якое дрэва.
2 І ўбачыў я іншага анёла, які ўзыходзіў ад усходу сонца, які меў пячатку Бога Жывога. І
закрычаў ён вялікім голасам да чатырох анёлаў, якім дадзена чыніць шкоду зямлі і мору,
кажучы:
3 «Не чыніце шкоды ані зямлі, ані мору, ані дрэвам, пакуль не паставім пячаткі на слугаў Бога
нашага на ілбах іхніх».
4 І пачуў я лічбу папячатаных — сто сорак чатыры тысячы папячатаных з усякага калена сыноў
Ізраіля.
5 З калена Юды — дванаццаць тысячаў папячатаных; з калена Рубэна — дванаццаць тысячаў
папячатаных; з калена Гада — дванаццаць тысячаў папячатаных;
6 з калена Асэра — дванаццаць тысячаў папячатаных; з калена Нэфталі — дванаццаць тысячаў
папячатаных; з калена Манасы — дванаццаць тысячаў папячатаных;
7 з калена Сымона — дванаццаць тысячаў папячатаных; з калена Левія — дванаццаць тысячаў
папячатаных; з калена Ісахара — дванаццаць тысячаў папячатаных;
8 з калена Завулёна — дванаццаць тысячаў папячатаных; з калена Язэпа — дванаццаць тысячаў
папячатаных; з калена Бэн'яміна — дванаццаць тясячаў папячатаных.
9 Пасьля гэтага ўбачыў я, і вось, вялізарны натоўп, палічыць якога ніхто ня мог, з усякага
народу, і калена, і племені, і мовы стаіць перад пасадам і перад Ягнём, апранутыя ў белыя
вопраткі, і пальмы ў руках іхніх,
10 і ўсклікаюць яны вялікім голасам, кажучы: «Збаўленьне ў Бога нашага, Які сядзіць на
пасадзе, і Ягняці!»
11 І ўсе анёлы стаялі вакол пасаду, і старостаў, і чатырох жывёлаў, і ўпалі яны перад пасадам
на абліччы свае, і пакланіліся Богу,
12 кажучы: «Амэн! Дабраслаўленьне, і слава, і мудрасьць, і падзяка, і пашана, і моц, і
магутнасьць Богу нашаму на вякі вякоў! Амэн!»
13 І адказаў адзін са старостаў, кажучы да мяне: «Гэтыя, апранутыя ў белыя вопраткі, хто яны
і адкуль прыйшлі?»
14 І я сказаў яму: «Пане, ты ведаеш». І ён сказаў мне: «Гэта тыя, якія прыйшлі з вялікага
прыгнёту. І яны памылі вопраткі свае і выбелілі вопраткі свае ў крыві Ягняці.

15 Дзеля гэтага яны перад пасадам Бога і служаць Яму ўдзень і ўначы ў бажніцы Ягонай; і Той,
Які сядзіць на пасадзе, паселіцца ў іх,
16 і ня будуць яны хацець есьці, і ня будуць смагнуць, і ня будзе пячы іх сонца і аніякая сьпёка,
17 бо Ягня, Які пасярод пасаду, будзе пасьвіць іх і вадзіць іх да жывых крыніцаў водаў, і абатрэ
Бог усякую сьлязіну з вачэй іхніх».

Адкр 8

1 І калі Ён адчыніў сёмую пячатку, сталася ціша ў небе недзе на паўгадзіны.
2 І ўбачыў я сем анёлаў, якія стаялі перад Богам, і былі дадзены ім сем трубаў.
3 І прыйшоў іншы анёл, і стаў перад ахвярнікам, маючы кадзільню залатую; і далі яму шмат
фіміяму, каб паклаў з малітвамі ўсіх сьвятых на залаты ахвярнік, што перад пасадам.
4 І ўзыйшоў дым фіміяму з малітвамі сьвятых з рукі анёла перад Богам.
5 І ўзяў анёл кадзільню, і напоўніў яе агнём з ахвярніку, і кінуў на зямлю; і сталіся галасы, і
грымоты, і маланкі, і землятрус.
6 І сем анёлаў, якія мелі сем трубаў, падрыхтаваліся, каб трубіць.
7 І першы анёл затрубіў, і стаўся град і агонь, зьмяшаныя з крывёю, і былі кінутыя на зямлю; і
трэцяя частка дрэваў згарэла, і ўся трава зялёная згарэла.
8 І другі анёл затрубіў, і быццам гара вялікая, якая агнём палае, была кінутая ў мора; і трэцяя
частка мора сталася крывёю,
9 і памерла трэцяя частка стварэньняў у моры, якія маюць душу, і трэцяя частка караблёў была
зьнішчаная.
10 І трэці анёл затрубіў, і ўпала з неба вялікая зорка, якая гарыць, як паходня, і ўпала на трэцюю
частку рэкаў і на крыніцы водаў,
11 і імя зоркі называецца Палын; і трэцяя частка [водаў] сталася палынам, і шмат людзей
памерла ад тых водаў, бо яны сталі горкімі.
12 І чацьвёрты анёл затрубіў, і былі пашкоджаная трэцяя частка сонца і трэцяя частка месяца
і трэцяя частка зорак, каб трэцяя частка іх зацьмілася, і каб дзень не сьвяціў трэцюю частку
сваю, і падобна ноч.
13 І ўбачыў я, і пачуў, як адзін анёл ляцеў пасярод неба і казаў вялікім голасам: «Гора, гора,
гора жыхарам зямлі ад рэшты трубных галасоў трох анёлаў, якія маюць трубіць!»

Адкр 9

1 І пяты анёл затрубіў, і ўбачыў я зорку, якая ўпала з неба на зямлю, і дадзены быў ёй ключ ад
калодзежа бездані,
2 і адчыніла яна калодзеж бездані, і ўзьняўся з калодзежа дым, як дым з вялікае печы; і
зацьмілася сонца і паветра ад дыму з калодзежа.
3 І з дыму выйшла на зямлю саранча, і дадзена ёй улада, як маюць уладу скарпіёны зямныя,
4 і сказана ёй, каб не рабіла шкоды ані траве зямной, ані ўсякай зеляніне, ані ўсякаму дрэву, а
толькі адным людзям, якія ня маюць пячаткі Божае на ілбах сваіх;
5 і дадзена ёй, каб не забівала іх, але каб мучыліся пяць месяцаў, і мучэньне ад яе, як мучэньне
ад скарпіёна, калі ўджаліць чалавека.
6 І ў тыя дні людзі будуць шукаць сьмерці і ня знойдуць яе, і будуць жадаць памерці, і сьмерць
будзе ўцякаць ад іх.
7 І выгляд саранчы падобны да коней, якія падрыхтаваныя на бітву, і на галовах у яе быццам
вянкі, падобныя да золата; і абліччы ў яе быццам абліччы чалавечыя,
8 і яна мела валасы, як валасы жаночыя, і зубы ў яе былі як у ільвоў.
9 І мела яна панцыры, быццам панцыры жалезныя, і гук крылаў ейных быццам гук мноства
калясьніцаў, [запрэжаных] коньмі, якія бягуць на бітву,
10 і мае хвасты, падобныя да скарпіёнавых, і ў хвастах у яе джала было, і ўлада яе — рабіць
шкоду людзям пяць месяцаў,

11 і мае над сабою за валадара анёла бездані, імя якога па-гебрайску — Абаддон, а па-грэцку
мае імя Апаліён.
12 Адно гора прайшло; вось, прыходзяць яшчэ два горы за ім.
13 І шосты анёл затрубіў, і я пачуў адзін голас з чатырох рагоў залатога ахвярніку, што перад
Богам,
14 які казаў да шостага анёла, што меў трубу: «Разьвяжы чатырох анёлаў, якія зьвязаныя над
вялікай ракой Эўфрат».
15 І былі разьвязаныя чатыры анёлы, якія былі падрыхтаваныя на гадзіну, і дзень, і месяц, і
год, каб забіць трэцюю частку людзей.
16 І лічба коннага войска — два дзясяткі тысячаў дзясяткаў тысячаў; і я пачуў лічбу іх.
17 І гэтак я ўбачыў коней у відзежы, і вершнікаў на іх, якія мелі панцыры агністыя і
гіяцынтавыя, і серкавыя; і галовы ў коней, як галовы ў ільвоў, і з храпаў іхніх выходзіць агонь,
і дым, і серка.
18 Трыма гэтымі была забіта трэцяя частка людзей: агнём, і дымам, і серкаю, што выходзілі з
храпаў іхніх.
19 Бо ўлада іхняя — у храпах іхніх, а хвасты іхнія падобныя да зьмеяў, маюць галовы і імі робяць
шкоду.
20 І рэшта людзей, што не была забітая плягамі гэтымі, не навярнулася ад справаў рук
сваіх, каб не пакланяцца дэманам і ідалам залатым, і срэбным, і мядзяным, і каменным, і
драўляным, якія ані бачыць ня могуць, ані чуць, ані хадзіць;
21 і не навярнуліся ад забойстваў сваіх, і ад чараўніцтва свайго, і ад распусты сваёй, і ад
крадзяжоў сваіх.

Адкр 10

1 І ўбачыў я іншага дужага анёла, які зыходзіў з неба, які быў апрануты ў воблака, і вясёлка
над галавою яго, і аблічча ягонае — як сонца, і ногі ягоныя — як слупы агністыя.
2 І меў ён у руцэ сваёй кніжку адкрытую, і паставіў ён правую нагу сваю на мора, а левую — на
зямлю,
3 і закрычаў голасам вялікім, як леў рыкае; і калі закрычаў ён, прагаварылі сем грымотаў
галасамі сваімі.
4 І калі прагаварылі сем грымотаў галасамі сваімі, я меўся пісаць, і пачуў я голас з неба, які
казаў мне: «Запячатай тое, што прагаварылі сем грымотаў, і не пішы гэтага».
5 І анёл, якога я бачыў, як ён стаяў на моры і на зямлі, узьняў руку сваю да неба
6 і пакляўся Тым, Які жыве на вякі вякоў, Які стварыў неба, і што ў ім, і зямлю, і што на ёй, і
мора, і што ў ім, што часу ўжо ня будзе,
7 але ў дні голасу сёмага анёла, калі той мае трубіць, зьдзейсьніцца таямніца Божая, як Ён
дабравесьціў слугам Сваім прарокам.
8 І голас, які я чуў з неба, ізноў прагаварыў да мяне і сказаў: «Ідзі, вазьмі кніжку разгорнутую
ў руцэ анёла, які стаіць на моры і на зямлі».
9 І я падыйшоў да анёла, кажучы яму: «Дай мне кніжку». І ён кажа мне: «Вазьмі і зьеш яе; і
яна стане горкаю ў тваім жываце, але ў вуснах тваіх будзе салодкая, як мёд».
10 І я ўзяў кніжку з рукі анёла, і зьеў яе, і яна была ў вуснах маіх салодкая, як мёд, і калі я зьеў
яе, стаў горкім жывот мой.
11 І ён кажа мне: «Ты мусіш ізноў прарочыць пра плямёны, і народы, і мовы, і валадароў
многіх».

Адкр 11

1 І дадзена мне трысьціна, падобная да кія; і анёл, які стаяў, сказаў: «Паўстань і памерай
бажніцу Божую, і ахвярнік, і тых, якія пакланяюцца ў ім,
2 а панадворак, які звонку бажніцы, пакінь звонку і ня мерай яго, бо ён дадзены паганам, і
горад сьвяты яны будуць таптаць сорак два месяцы.

3 І Я дам двум сьведкам Маім, і яны будуць прарочыць тысячу дзьвесьце шэсьцьдзясят дзён,
апранутыя ў зрэбніцу».
4 Гэта ёсьць дзьве аліўкі і два сьвечнікі, якія перад Богам зямлі стаяць.
5 І калі хто захоча зрабіць ім шкоду, агонь выйдзе з вуснаў іхніх і зьесьць ворагаў іхніх; і калі
хто захоча зрабіць ім шкоду, мусіць ён быць забіты.
6 Яны маюць уладу замкнуць неба, каб не ішоў дождж у дні прараканьня іхняга; і маюць
уладу над водамі перамяніць іх у кроў і біць зямлю ўсякімі плягамі, калі толькі захочуць.
7 І калі яны скончаць сьведчаньне сваё, зьвер, які выйдзе з бездані, учыніць вайну з імі, і
пераможа іх, і заб'е іх.
8 І целы іхнія [будуць ляжаць] на вуліцы вялікага гораду, які называецца духоўна Садом і
Эгіпет, дзе і Госпад наш быў укрыжаваны.
9 І з плямёнаў, і каленаў, і моваў, і народаў будуць глядзець на целы іхнія тры дні і паўдня, і
не дазволяць пакласьці целы іхнія ў магілы.
10 І жыхары зямлі будуць радавацца дзеля іх і весяліцца, і будуць пасылаць адны адным
падарункі, бо гэтыя два прарокі мучылі жыхароў зямлі.
11 І праз тры дні і паўдня дух жыцьця ад Бога зыйшоў на іх, і яны сталі на ногі свае, і страх
вялікі прыйшоў на тых, якія бачылі іх.
12 І пачулі яны голас вялікі з неба, які казаў да іх: «Узыйдзіце сюды». І яны ўзыйшлі ў неба ў
воблаку, і бачылі іх ворагі іхнія.
13 І ў тую гадзіну стаўся землятрус вялікі, і дзясятая частка гораду завалілася, і былі забітыя
ў землятрусе сем тысячаў імёнаў чалавечых; і іншыя сталіся ў страху і аддалі славу Богу
Нябеснаму.
14 Другое гора прайшло; вось, трэцяе гора прыходзіць хутка.
15 І сёмы анёл затрубіў, і сталіся вялікія галасы ў небе, якія казалі: «Валадарствы сьвету сталіся
[Валадарствам] Госпада нашага і Хрыста Ягонага, і Ён будзе валадарыць на вякі вякоў».
16 І дваццаць чатыры старосты, якія сядзелі перад Богам на пасадах сваіх, упалі на абліччы
свае і пакланіліся Богу,
17 кажучы: «Дзякуем Табе, Госпадзе, Бог Усеўладны, Які ёсьць, і Які быў, і Які прыходзіш, што
прыняў Ты моц Сваю вялікую і запанаваў.
18 І загневаліся пагане, і прыйшоў гнеў Твой, і час судзіць мёртвых і даць нагароду слугам
Тваім прарокам і сьвятым, і тым, якія баяцца імя Твайго, малым і вялікім, і вынішчыць тых,
якія нішчаць зямлю».
19 І адчынілася бажніца Божая ў небе, і зьявіўся каўчэг запавету Ягонага ў бажніцы Ягонай; і
сталіся маланкі, і галасы, і грымоты, і землятрус, і град вялікі.

Адкр 12

1 І знак вялікі зьявіўся ў небе: жанчына, апранутая ў сонца, і месяц пад нагамі ў яе, і на галаве
ў яе вянок з дванаццаці зорак.
2 І, маючы ва ўлоньні, яна крычала ад болю і мукаў радзінаў.
3 І зьявіўся другі знак у небе: і вось, цмок вялікі, чырвоны, які меў сем галоваў і дзесяць рагоў,
і на галовах ягоных — сем дыядэмаў,
4 і хвост ягоны сьцягнуў трэцюю частку зорак нябесных і кінуў іх на зямлю. І цмок стаў перад
жанчынай, якая мелася нарадзіць, каб, калі народзіць, зжэрці дзіця яе.
5 І нарадзіла сына, хлопчыка, які мае пасьвіць усе народы кіем жалезным; і было ўзятае
дзіцятка яе да Бога і пасаду Ягонага,
6 і жанчына ўцякла ў пустыню, дзе мае месца, падрыхтаванае ад Бога, каб там жывілі яе тысячу
дзьвесьце шэсьцьдзясят дзён.
7 І сталася вайна ў небе: Міхал і анёлы ягоныя ваявалі супраць цмока, і цмок ваяваў, і анёлы
ягоныя,
8 і не адолелі, і не знайшлося ўжо месца для іх у небе.

9 І быў скінуты цмок вялікі, зьмей старадаўны, называны д'яблам і шатанам, які падманвае
ўвесь сусьвет, скінуты на зямлю, і анёлы ягоныя былі скінутыя з ім разам.
10 І пачуў я голас вялікі, які казаў у небе: «Цяпер сталася збаўленьне, і моц, і Валадарства
Бога нашага, і ўлада Хрыста Ягонага, бо скінуты абвінавальнік братоў нашых, які дзень і ноч
вінаваціў іх перад Богам нашым.
11 І яны перамаглі яго праз кроў Ягняці і праз слова сьведчаньня свайго і не любілі душы сваёй
аж да сьмерці.
12 Дзеля гэтага весяліцеся, нябёсы і тыя, якія жывуць у іх! Гора жыхарам зямлі і мора, бо
зыйшоў да вас д'ябал, маючы ярасьць вялікую, ведаючы, што ня шмат мае часу».
13 І калі ўбачыў цмок, што ён скінуты на зямлю, пачаў ён перасьледаваць жанчыну, якая
нарадзіла хлопчыка.
14 І дадзены жанчыне два крылы вялікага арла, каб ляцела ў пустыню на месца сваё ад аблічча
зьмея, дзе будуць жывіць яе пару, поры і паўпары.
15 І пусьціў зьмей за жанчынай з пашчы сваёй ваду, як раку, каб рака панесла яе.
16 І дапамагла зямля жанчыне, і расчыніла зямля вусны свае, і праглынула раку, якую пусьціў
цмок з пашчы сваёй.
17 І разьюшыўся цмок на жанчыну, і пайшоў ваяваць з рэштай насеньня яе, якія захоўваюць
прыказаньні Божыя і маюць сьведчаньне Ісуса Хрыста.

Адкр 13

1 І стаў я на пяску марскім; і ўбачыў зьвера, які выходзіў з мора, які меў сем галоваў і дзесяць
рагоў; і на рагах ягоных — дзесяць дыядэмаў, і на галовах ягоных — імя блюзьнерскае.
2 І зьвер, якога я ўбачыў, быў падобны да рыся, і ногі ягоныя — як у мядзьведзя, і пашча ягоная
— як пашча ільвіная. І даў яму цмок моц сваю, і пасад свой, і ўладу вялікую.
3 І ўбачыў я, [што] адна з галоваў ягоных, быццам на сьмерць забітая, і рана яе сьмяротная
аздаравілася, і зьдзіўлялася ўся зямля ззаду за зьверам,
4 і пакланіліся цмоку, які даў уладу зьверу, і пакланіліся зьверу, кажучы: «Хто падобны да
гэтага зьвера? Хто можа ваяваць з ім?»
5 І дадзены яму вусны, якія гавораць вялікае і блюзьнерскае, і дадзена яму ўлада дзейнічаць
сорак два месяцы.
6 І ён расчыніў вусны свае дзеля блюзьнерства супраць Бога, каб блюзьніць на імя Ягонае, і
намёт Ягоны, і тых, якія жывуць у небе.
7 І дадзена яму весьці вайну са сьвятымі і перамагчы іх; і дадзена яму ўлада над усякім
каленам, і моваю, і народам.
8 І паклоняцца яму ўсе жыхары зямлі, імёны якіх не запісаныя ў кнігу жыцьця Ягняці, забітага
ад заснаваньня сьвету.
9 Калі хто мае вуха, няхай слухае.
10 Калі хто вядзе ў палон, у палон пойдзе; калі хто мячом забівае, сам мусіць быць мячом
забіты. Тут цярплівасьць і вера сьвятых.
11 І ўбачыў я другога зьвера, які выходзіў з зямлі, і меў ён два рогі, падобныя да ягнячых, і
гаварыў, як цмок.
12 І ўсю ўладу першага зьвера ён зьдзяйсьняе перад ім, і робіць, каб зямля і жыхары яе
пакланяліся першаму зьверу, у якога аздароўлена сьмяротная рана ягоная.
13 І робіць знакі вялікія, і агонь робіць, каб зыходзіў з неба на зямлю перад людзьмі,
14 і падманвае жыхароў зямлі знакамі, якія дадзена яму рабіць перад зьверам, кажучы
жыхарам зямлі зрабіць вобраз зьвера, што мае рану ад мяча і жывы.
15 І дадзена яму даць дух вобразу зьвера, каб вобраз зьвера і гаварыў, і рабіў, каб тыя, хто не
паклоніцца вобразу зьвера, былі забітыя.
16 І робіць, каб усім: малым, і вялікім, і багатым, і ўбогім, і свабодным, і слугам — была дадзена
пазнака на правую руку іхнюю або на лоб іхні,

17 і каб ніхто ня мог ані купляць, ані продаць, акрамя тых, якія маюць пазнаку, або імя зьвера,
або лічбу імя ягонага.
18 Вось тут мудрасьць. Хто мае розум, няхай аблічыць лічбу зьвера; бо гэта лічба чалавека, і
лічба яго шэсьцьсот шэсьцьдзясят шэсьць.

Адкр 14

1 І ўбачыў я, і вось, Ягня, Які стаіць на гары Сыён, і з Ім сто сорак чатыры тысячы тых, якія
маюць імя Айца Ягонага, напісанае на ілбах іхніх.
2 І пачуў я голас з неба, як голас мноства водаў, і як голас грымотаў вялікіх; і пачуў я голас
гусьляроў, якія граюць на гусьлях сваіх.
3 І яны сьпяваюць нібы новы сьпеў перад пасадам, і перад чатырма жывёламі, і старостамі, і
ніхто ня мог навучыцца сьпеву [гэтаму], акрамя ста сарака чатырох тысячаў, што адкупленыя
ад зямлі.
4 Гэта тыя, якія не апаганіліся з жанчынамі, бо яны ў дзявоцтве; гэта тыя, якія ідуць за Ягнём,
куды б Ён ні ішоў. Яны адкуплены ад людзей, першынцы Богу і Ягняці,
5 і ў вуснах іхніх ня знойдзена хітраваньня, бо яны беззаганныя перад пасадам Божым.
6 І ўбачыў я іншага анёла, які ляцеў па сярэдзіне неба, які меў вечнае Эвангельле, каб
дабравесьціць жыхарам зямлі, і ўсім народам, і каленам, і мовам, і плямёнам,
7 і казаў голасам вялікім: «Бойцеся Бога, і аддайце Яму славу, бо прыйшла гадзіна суду
Ягонага, і пакланіцеся Таму, Які стварыў неба, і зямлю, і мора, і крыніцы водаў».
8 І іншы анёл ішоў за [ім], кажучы: «Упаў, упаў Бабілон, горад вялікі, бо віном ярасьці распусты
сваёй ён напаіў усе народы».
9 І трэці анёл ішоў за імі, кажучы голасам вялікім: «Калі хто пакланяецца зьверу і вобразу
ягонаму і атрымлівае пазнаку на лоб свой ці на руку сваю,
10 той будзе піць віно ярасьці Божай, налітае без дамешкаў у келіх гневу Ягонага, і будзе
мучыцца ў агні і ў серцы перад сьвятымі анёламі і перад Ягнём,
11 і дым мучэньняў іхніх будзе ўзьнімацца на вякі вякоў, і ня будуць мець супачынку ўдзень і
ўначы тыя, якія пакланяюцца зьверу і вобразу ягонаму, і якія атрымалі пазнаку імя ягонага.
12 Тут цярплівасьць сьвятых; тут тыя, якія захоўваюць прыказаньні Божыя і веру Ісусаву».
13 І пачуў я голас з неба, які казаў мне: «Напішы: “Адгэтуль шчасьлівыя мёртвыя, якія
паміраюць у Госпадзе. Так, — кажа Дух, — каб яны супачылі ад працаў сваіх, і справы іхнія
ідуць за імі”».
14 І ўбачыў я, і вось воблака белае, і на воблаку сядзіць падобны да Сына Чалавечага, Які мае
на галаве Сваёй вянок залаты і ў руцэ Сваёй — серп востры.
15 І іншы анёл выйшаў з бажніцы, закрычаўшы вялікім голасам да Таго, Які сядзеў на воблаку:
«Пашлі серп Твой і жні; бо прыйшла для Цябе гадзіна жніва, бо сасьпела жніво зямлі».
16 І кінуў Той, Які сядзеў на воблаку, серп Свой на зямлю, і зямля была зжатая.
17 І іншы анёл выйшаў з бажніцы, што ў небе, сам маючы серп востры.
18 І іншы анёл выйшаў з ахвярніку, маючы ўладу над агнём, і ўсклікнуў крыкам вялікім да
таго, які меў серп востры, кажучы: «Пашлі твой серп востры і зьбяры ягады вінаграду зямлі,
бо сасьпелі гронкі яго».
19 І кінуў анёл серп свой на зямлю, і сабраў вінаград зямлі, і кінуў яго ў тоўчню вялікую ярасьці
Божай;
20 і патапталі яго ў тоўчні па-за горадам, і выйшла кроў з тоўчні аж да цугляў конскіх на тысячу
шэсьцьсот стадыяў.

Адкр 15

1 І ўбачыў я іншы знак у небе, вялікі і дзіўны: сем анёлаў, якія маюць сем плягаў апошніх, якімі
мае скончыцца ярасьць Божая.

2 І ўбачыў я нібы мора шкляное, зьмяшанае з агнём, і тых, якія перамагаюць зьвера, і вобраз
ягоны, і пазнаку ягоную, і лічбу імя ягонага, якія стаяць на моры шкляным, маючы гусьлі
Божыя,
3 і сьпяваюць сьпеў Майсея, слугі Божага, і сьпеў Ягняці, кажучы: «Вялікія і дзіўныя справы
Твае, Госпадзе, Божа Ўсеўладны! Справядлівыя і праўдзівыя шляхі Твае, Валадару сьвятых!
4 Хто не спалохаецца Цябе, Госпадзе, і не праславіць імя Тваё? Бо адзін Ты — Сьвяты, бо ўсе
народы прыйдуць і паклоняцца перад Табою, бо выявілася праведнасьць Твая».
5 І пасьля гэтага ўбачыў я, і вось, адчынілася бажніца намёту сьведчаньня ў небе,
6 і выйшлі з бажніцы сем анёлаў, якія маюць сем плягаў, апранутыя ў ільняную вопратку,
чыстую і сьветлую, і падперазаныя праз грудзі паясамі залатымі.
7 І адна з чатырох жывёлаў дала сямі анёлам сем чараў залатых, поўных ярасьці Бога, Які жыве
на вякі вякоў.
8 І напоўнілася бажніца дымам ад славы Божае і ад моцы Ягонае, і ніхто ня мог увайсьці ў
бажніцу, пакуль ня зьдзейсьніліся сем плягаў сямі анёлаў.

Адкр 16

1 І пачуў я голас вялікі з бажніцы, які казаў да сямі анёлаў: «Ідзіце і выліце чары ярасьці Божай
на зямлю».
2 І пайшоў першы, і выліў чару сваю на зямлю, і сталіся благія і балючыя скулы ў людзей, якія
мелі пазнаку зьвера і пакланяліся вобразу ягонаму.
3 І другі анёл выліў чару сваю ў мора, і сталася кроў, быццам мёртвага, і ўсякая душа жывая
памерла ў моры.
4 І трэці анёл выліў чару сваю ў рэкі і крыніцы водаў, і сталася кроў.
5 І пачуў я анёла водаў, які казаў: «Праведны Ты, Госпадзе, Які ёсьць, і Які быў, і Сьвяты, што
прысудзіў гэтак,
6 бо кроў сьвятых і прарокаў яны вылілі, і кроў Ты даў ім піць, бо яны вартыя гэтага».
7 І пачуў я іншага, які казаў з ахвярніку: «Так, Госпадзе, Божа Ўсеўладны, слушныя і праведныя
суды Твае».
8 І чацьвёрты анёл выліў чару сваю на сонца, і дадзена яму паліць людзей у агні.
9 І паліла людзей вялікая сьпёка, і блюзьнілі яны на імя Бога, Які мае ўладу над гэтымі плягамі,
і не навярнуліся, каб даць Яму славу.
10 І пяты анёл выліў чару сваю на пасад зьвера, і сталася, што валадарства ягонае зацемрылася,
і яны кусалі языкі свае ад болю
11 і блюзьнілі на Бога Нябеснага дзеля болю свайго і скулаў сваіх, і не навярнуліся ад справаў
сваіх.
12 І шосты анёл выліў чару сваю ў вялікую раку Эўфрат, і высахла вада ў ёй, каб падрыхтаваны
быў шлях для валадароў, што ад усходу сонца.
13 І ўбачыў я: з вуснаў цмока, і з вуснаў зьвера, і з вуснаў фальшывага прарока [выйшлі] тры
духі нячыстыя, падобныя да жабаў,
14 бо гэта — духі дэманаў, якія чыняць знакі, якія зыходзяць на валадароў зямлі і ўсяго
сусьвету, каб сабраць іх на вайну ў той дзень вялікі Бога Усеўладнага.
15 «Вось, прыходжу, як злодзей. Шчасьлівы той, які чувае і захоўвае адзеньне сваё, каб не
хадзіць яму голым, і каб ня бачылі непрыстойнасьці ягонай».
16 І сабраў ён іх у месцы, якое па-гебрайску называецца Армагедон.
17 І сёмы анёл выліў чару сваю на паветра, і выйшаў голас вялікі з бажніцы нябеснай, ад пасаду,
які казаў: «Сталася!»
18 І сталіся галасы, і грымоты, і маланкі, і землятрус стаўся вялікі, якога ня было ад [часоў],
як зьявіліся людзі на зямлі. Гэткі землятрус! Такі вялікі!
19 І распаўся горад вялікі на тры часткі, і гарады паганаў заваліліся; і Бабілон вялікі быў
узгаданы перад Богам, каб даць яму келіх віна ярасьці гневу Ягонага.
20 І кожны востраў уцёк, і гары не знайшлося.

21 І град вялікі, як таленты, зыйшоў з неба на людзей, і блюзьнілі людзі на Бога за плягу граду,
бо вельмі вялікая была пляга гэтая.

Адкр 17

1 І прыйшоў адзін з сямі анёлаў, якія мелі сем чараў, і загаварыў да мяне, кажучы мне:
«Хадзем, я пакажу табе суд над распусьніцай вялікай, якая сядзіць над мноствам водаў,
2 з якою распусьнічалі валадары зямныя, і віном распусты яе напіваліся жыхары зямлі».
3 І ён павёў мяне ў духу ў пустыню, і ўбачыў я жанчыну, якая сядзела на зьверы пунсовым,
поўным імёнаў блюзьнерскіх, які меў сем галоваў і дзесяць рагоў.
4 І жанчына была апранутая ў пурпур і кармазын, і аздобленая золатам і каштоўным камянём
і пэрламі, і мела ў руцэ сваёй келіх залаты, поўны агіды і нячыстасьці распусты яе.
5 І на ілбе ў яе напісанае імя: «Тайна, Бабілон вялікі, маці распусьніц і агіды зямлі».
6 І ўбачыў я, што жанчына напіваецца крывёю сьвятых і крывёю сьведкаў Ісуса. І, бачачы яе, я
зьдзіўляўся зьдзіўленьнем вялікім.
7 І сказаў мне анёл: «Што ты зьдзіўляешся? Я табе скажу таямніцу жанчыны і зьвера, які носіць
яе і мае сем галоваў і дзесяць рагоў.
8 Зьвер, якога ты бачыў, быў і няма яго, і мае выйсьці з бездані і пайсьці на загубу; і зьдзівяцца
жыхары зямлі, імёны якіх не запісаныя ў кнігу жыцьця ад заснаваньня сьвету, гледзячы на
зьвера, што ён быў і няма яго, хаця ёсьць.
9 Тут розум, які мае мудрасьць. Сем галоваў ёсьць сем гор, дзе жанчына сядзіць на іх,
10 і сем валадароў: пяць упалі, і адзін ёсьць, іншы яшчэ не прыйшоў і, калі прыйдзе, нядоўга
мусіць быць.
11 І зьвер, які быў і няма яго, ён — восьмы, і з сямі ён ёсьць, і на загубу ідзе.
12 І дзесяць рагоў, якія ты бачыў, ёсьць дзесяць валадароў, якія яшчэ не атрымалі валадарства,
але атрымаюць уладу, як валадары, на адну гадзіну разам са зьверам.
13 Яны маюць адну думку і моц і аддаюць уладу сваю зьверу.
14 Яны будуць ваяваць з Ягнём, і Ягня пераможа іх, бо Ён — Пан паноў і Валадар валадароў, а
тыя, што з Ім, — пакліканыя, і выбраныя, і верныя».
15 І кажа мне: «Воды, якія ты бачыў, дзе сядзіць распусьніца, — гэта плямёны, і натоўпы, і
народы, і мовы.
16 І дзесяць рагоў, якія ты бачыў на зьверы, яны зьненавідзяць распусьніцу, і спустошаць яе, і
аголяць, і цела яе зьядуць, і спаляць яе ў агні;
17 бо Бог даў у сэрца іхняе ўчыніць думку Ягоную, і ўчыніць аднадумна, і даць валадарства
сваё зьверу, пакуль ня зьдзейсьняцца словы Божыя.
18 І жанчына, якую ты бачыў, — гэта горад вялікі, які мае валадарства над валадарамі
зямнымі».

Адкр 18

1 І пасьля гэтага ўбачыў я анёла, які зыходзіў з неба, які меў вялікую ўладу; і зямля была
асьветленая ад славы ягонае;
2 І закрычаў ён моцна голасам вялікім, кажучы: «Упаў, упаў Бабілон, вялікая [распусьніца],
і стаўся жытлом дэманаў, і прыбежышчам усякага духа нячыстага, і прыбежышчам усякай
птушкі нячыстай і брыдкай,
3 бо віном ярасьці распусты сваёй яна напаіла ўсе народы, і валадары зямныя распусьнічалі з
ёю, і купцы зямныя ўзбагаціліся з моцы раскошы яе».
4 І пачуў я іншы голас з неба, які казаў: «Выйдзі з яе, народзе Мой, каб ня ўдзельнічаць у грахах
ейных і не атрымаць плягаў ейных;
5 бо дайшлі грахі яе аж да неба, і ўзгадаў Бог пра нягоднасьці ейныя.
6 Аддайце ёй, як і яна аддавала вам, і падвойце ёй удвая паводле справаў яе; у келіх, у які яна
налівала, наліце ёй удвая.
7 Колькі ўслаўляла яна сябе і раскашавалася, гэтулькі дайце ёй мучэньняў і плачу, бо яна
казала ў сэрцы сваім: “Сяджу валадаркаю, і не ўдава я, і плачу ня буду бачыць».

8 Дзеля гэтага ў адзін дзень прыйдуць на яе плягі: сьмерць, і плач, і голад; і будзе яна спалена
ў агні, бо магутны Госпад Бог, Які судзіць яе.
9 І загалосяць, і заплачуць па ёй валадары зямныя, якія распусьнічалі і раскашаваліся з ёю, калі
ўбачаць дым ад пажару яе,
10 стаўшы здалёк дзеля страху ад мучэньняў яе і кажучы: «Гора, гора, горад вялікі Бабілон,
горад магутны, бо ў адну гадзіну прыйшоў суд твой!»
11 І купцы зямныя галосяць і плачуць па ёй, бо ніхто ўжо не купляе тавару іхняга,
12 тавару з золата, і срэбра, і каштоўнага камяня, і пэрлаў, і вісону, і пурпуру, і ядвабу, і
кармазыну, і ўсякага дрэва пахкага, і ўсякіх вырабаў з косьці слановае, і ўсякіх вырабаў з дрэва
каштоўнага, і медзі, і жалеза, і мармуру,
13 і цынамону, і фіміяму, і міра, і ладану, і віна, і алею, і мукі, і пшаніцы, і скаціны, і авечак, і
коней, і вазоў, і целаў і душаў чалавечых.
14 «І плады пажаданьня душы тваёй адыйшлі ад цябе; і ўсё тлустае і бліскучае адыйшло ад
цябе, і ты ніколі ўжо ня знойдзеш гэтага».
15 І гандляры гэтага, якія ўзбагаціліся ад яе, будуць стаяць здалёк дзеля страху ад мучэньняў
яе, плачучы і галосячы,
16 і кажучы: «Гора, гора, горад вялікі, апрануты ў вісон, і пурпур, і кармазын, і аздоблены
золатам, і каштоўным камянём, і пэрламі,
17 бо ў адну гадзіну спустошана гэткае багацьце!» І ўсе корнікі, і ўсе людзі на караблях, і
маракі, і ўсе працаўнікі на моры сталі здалёк
18 і, гледзячы на дым ад пажару яго, крычалі, кажучы: «Што падобна да гораду вялікага?»
19 І сыпалі пыл на галовы свае, і крычалі, плачучы і галосячы, і кажучы: «Гора, гора, горад
вялікі, у якім узбагаціліся ад каштоўнасьцяў ягоных усе, хто мае караблі на моры, бо ў адну
гадзіну ён спустошаны!
20 Весяліся над ім, неба і сьвятыя апосталы і прарокі, бо прысудзіў Бог прысуд ваш на яго».
21 І ўзяў адзін дужы анёл камень вялікі, як млыновы, і кінуў у мора, кажучы: «Гэтак з сілаю
кінуты будзе Бабілон, горад вялікі, і ўжо больш ня знойдуць яго.
22 І ня будзе ўжо чутно ў табе голасу гусьляроў, і музыкаў, і жалейнікаў, і трубачоў, і ня будзе
знойдзена ўжо ў табе ніводнага майстра, і ніякага майстэрства, і голас млыновы ня будзе
чутны ўжо ў табе,
23 і ня зьявіцца ўжо ў табе сьвятло сьвечкі, і голас жаніха і нявесты ня будзе чутны ўжо ў табе,
бо купцы твае былі магнатамі зямлі, бо чараваньнямі тваімі падманутыя ўсе народы.
24 І знойдзена ў ім кроў прарокаў, і сьвятых, і ўсіх забітых на зямлі».

Адкр 19

1 І пасьля гэтага пачуў я голас вялікі мноства народу ў небе, які казаў: «Альлелюя! Збаўленьне,
і слава, і пашана, і моц Госпаду, Богу нашаму!
2 Бо слушныя і справядлівыя суды Ягоныя, бо засудзіў Ён вялікую распусьніцу, якая паганіла
зямлю распустаю сваёю, і адпомсьціў за кроў слугаў Сваіх ад рукі яе».
3 І другі раз сказалі: «Альлелюя! І дым яе ўзьнімаецца на вякі вякоў».
4 І ўпалі дваццаць чатыры старосты і чатыры жывёлы, і пакланіліся Богу, Які сядзіць на
пасадзе, кажучы: «Амэн! Альлелюя!»
5 І выйшаў голас з пасаду, які казаў: «Хваліце Бога нашага, усе слугі Ягоныя і тыя, хто баіцца
Яго, і малыя, і вялікія!»
6 І пачуў я быццам голас шматлікага натоўпу, і быццам голас мноства водаў, і быццам гук
грымотаў моцных, які казаў: «Альлелюя! Бо заваладарыў Госпад, Бог Усеўладны!
7 Узрадуемся, і ўзьвесялімся, і дамо славу Яму, бо прыйшло вясельле Ягняці, і жонка Ягоная
падрыхтавала сябе».
8 І дадзена ёй, каб апранулася ў вісон чысты і сьветлы; вісон жа — гэта праведнасьць сьвятых.
9 І кажа мне: “Напішы: «Шчасьлівыя тыя, якія пакліканыя на вячэру вясельную Ягняці». І кажа
мне: «Гэта ёсьць праўдзівыя словы Божыя».

10 І я ўпаў да ног ягоных, каб пакланіцца яму, і ён кажа мне: «Глядзі, не [рабі гэтага]! Я —
таварыш твой і братоў тваіх, якія маюць сьведчаньне Ісуса. Богу пакланіся, бо сьведчаньне
Ісуса ёсьць дух прароцтва».
11 І ўбачыў я неба адчыненае, і вось, конь белы, і Вершнік на ім, называны Верным і
Праўдзівым, і Ён паводле справядлівасьці судзіць і ваюе.
12 А вочы Ягоныя — як полымя агню, і на галаве Ягонай шмат дыядэмаў. Ён мае імя напісанае,
якога ніхто ня ведае, апрача Яго Самога.
13 І Ён апрануты ў шату акрываўленую, і імя Ягонае называецца: «Слова Божае».
14 І ішлі за Ім войскі нябесныя на белых конях, апранутыя ў вісон белы і чысты.
15 І з вуснаў Ягоных выходзіць меч востры, каб ім біць народы, і Ён будзе пасьвіць іх кіем
жалезным. І Ён топча тоўчню віна ярасьці і гневу Бога Ўсеўладнага.
16 І мае на шатах і на сьцягне Сваім напісанае імя: «Валадар валадароў і Пан паноў».
17 І ўбачыў я аднаго анёла, які стаяў на сонцы. І крыкнуў ён голасам вялікім, кажучы да ўсіх
птушак, якія лёталі па сярэдзіне неба: «Хадземце, зьбірайцеся на вячэру Вялікага Бога,
18 каб есьці целы валадароў, і целы тысячнікаў, і целы дужых, і целы коней і вершнікаў на іх,
і целы ўсіх свабодных, і слугаў, і малых, і вялікіх».
19 І ўбачыў я зьвера, і валадароў зямных, і войскі іхнія, сабраныя дзеля вайны з Тым, Які сядзіць
на кані, і з войскам Ягоным.
20 І быў схоплены зьвер, і з ім — фальшывы прарок, які рабіў знакі перад ім, якімі падманваў
тых, што атрымалі пазнаку зьвера і пакланяліся вобразу ягонаму. Абодва жыўцом былі
кінутыя ў возера агню, якое палае серкаю.
21 І рэшта была забітая мячом, што выходзіў з вуснаў Таго, Які сядзеў на кані. І ўсе птушкі
насыціліся целамі іхнімі.

Адкр 20

1 І ўбачыў я анёла, які зыходзіў з неба, які меў ключ ад бездані і ланцуг вялікі ў руцэ сваёй.
2 І ён меў уладу над цмокам, зьмеем старадаўным, які ёсьць д'ябал і шатан, і зьвязаў яго на
тысячу гадоў,
3 і кінуў яго ў бездань, і замкнуў яго, і запячатаў зьверху, каб не падманваў больш народы,
пакуль ня скончыцца тысяча гадоў; і пасьля гэтага мусіць быць разьвязаны на малы час.
4 І ўбачыў я пасады, і сядзелі на іх, і быў ім дадзены суд, і душы сьцятых за сьведчаньне Ісуса
і за слова Божае, і тых, якія не пакланіліся зьверу і вобразу ягонаму, і не атрымалі пазнакі на
лоб свой і на руку сваю. І яны ажылі, і валадарылі з Хрыстом тысячу гадоў.
5 А рэшта мёртвых не ажыла, пакуль ня скончыцца тысяча гадоў. Гэта — уваскрасеньне
першае.
6 Шчасьлівы і сьвяты той, хто мае частку ў першым уваскрасеньні; над імі сьмерць другая ня
мае ўлады, але яны будуць сьвятарамі Бога і Хрыста і будуць валадарыць з Ім тысячу гадоў.
7 І калі скончыцца тысяча гадоў, будзе разьвязаны шатан з вязьніцы сваёй
8 і выйдзе падманваць народы на чатырох кутах зямлі, Гога і Магога, ды зьбіраць іх на вайну;
лічба іх — як пясок марскі.
9 І яны ўзыйшлі на шырыню зямлі, і атачылі табар сьвятых і горад улюбёны, і зыйшоў ад Бога
з неба агонь, і зжор іх.
10 І д'ябал, які падманваў іх, быў кінуты ў возера агню і серкі, дзе зьвер і фальшывы прарок; і
будуць яны мучыцца ўдзень і ўначы на вякі вякоў.
11 І ўбачыў я вялікі белы пасад і Таго, Які сядзеў на ім, ад аблічча Якога ўцяклі зямля і неба, і
не знайшлося месца для іх.
12 І ўбачыў я мёртвых, малых і вялікіх, якія стаялі перад Богам. І былі разгорнутыя кнігі;
і разгарнулі іншую кнігу, якая ёсьць [кніга] жыцьця, і былі суджаныя мёртвыя паводле
напісанага ў кнігах, паводле справаў сваіх.
13 І аддало мора мёртвых, што ў ім, і сьмерць ды пекла аддалі мёртвых, што ў іх; і быў суджаны
кожны паводле справаў сваіх.

14 А сьмерць і пекла кінутыя ў возера агню. Гэта — другая сьмерць.
15 І калі хто ня быў знойдзены запісаным у кнізе жыцьця, той быў кінуты ў возера агню.

Адкр 21

1 І ўбачыў я новае неба і новую зямлю, бо першае неба і першая зямля прамінулі, і мора ўжо
няма.
2 І я, Ян, убачыў горад сьвяты, новы Ерусалім, які зыходзіў ад Бога з неба, падрыхтаваны як
нявеста, аздобленая дзеля мужа свайго.
3 І пачуў я голас вялікі з неба, які казаў: «Вось, намёт Бога з людзьмі, і Ён будзе жыць з імі; і
яны будуць народам Ягоным, і Сам Бог будзе з імі Богам іхнім.
4 І абатрэ Бог усякую сьлязу з вачэй іхніх; і сьмерці ўжо ня будзе, і ня будзе ўжо ані плачу, ані
крыку, ані болю, бо ранейшае прамінула».
5 І сказаў Той, Які сядзіць на пасадзе: «Вось, Я раблю ўсё новае». І кажа мне: «Напішы, бо гэтыя
словы праўдзівыя і верныя».
6 І сказаў мне: «Сталася. Я — Альфа і Амэга, Пачатак і Канец. Таму, хто смагне, Я дам з крыніцы
вады жыцьця дарма.
7 Той, хто пераможа, возьме ў спадчыну ўсё, і Я буду яму Богам, і ён будзе Мне сынам.
8 А для палахлівых і бязьверных, і брыдотных, і забойцаў, і распусьнікаў, і чараўнікоў, і
ідалапаклоньнікаў, і ўсіх хлусьлівых частка іхняя — у возеры, якое палае агнём і серкаю. Гэта
— другая сьмерць».
9 І прыйшоў да мяне адзін з сямі анёлаў, якія мелі сем чараў, напоўненых сямю апошнімі
плягамі, і загаварыў са мною, кажучы: «Хадзем, пакажу табе жанчыну, нявесту Ягняці».
10 І ён павёў мяне ў духу на вялікую і высокую гару, і паказаў мне горад вялікі, сьвяты Ерусалім,
які зыходзіць з неба ад Бога
11 і мае славу Божую. І сьвятло ягонае падобнае да найкаштоўнейшага камяня, накшталт
камяня ясьпісу, што зіхціць, як крышталь.
12 І ён мае мур вялікі і высокі, і мае дванаццаць брамаў, і на брамах — дванаццаць анёлаў і
напісаныя імёны дванаццаці каленаў сыноў Ізраіля:
13 ад усходу — тры брамы, ад поўначы — тры брамы, ад поўдня — тры брамы, ад захаду — тры
брамы.
14 І мур гораду мае дванаццаць падмуркаў, і на іх — імёны дванаццаці апосталаў Ягняці.
15 І той, які гаварыў са мною, меў трысьціну залатую, каб абмераць горад, і брамы ягоныя, і
мур ягоны.
16 І горад ляжыць чатырохкутнікам, і даўжыня ягоная такая самая, як і шырыня. І ён абмераў
горад трысьцінай на дванаццаць тысячаў стадыяў; і даўжыня, і шырыня, і вышыня ягоныя
аднолькавыя.
17 І ён абмераў мур ягоны на сто сорак чатыры локці меры чалавечае, якая і анёльская.
18 І мур быў пабудаваны з ясьпісу; а горад — з чыстага золата, падобнага да шкла чыстага.
19 І падмуркі муру гораду аздобленыя ўсякім каштоўным камянём: першы падмурак —
ясьпісам, другі — сапфірам, трэці — хальцэдонам, чацьвёрты — шмарагдам,
20 пяты — сардоніксам, шосты — сардам, сёмы — хрызалітам, восьмы — бэрылем, дзявяты —
тапазам, дзясяты — хрызапразам, адзінаццаты — гіяцынтам, дванаццаты — амэтыстам.
21 І дванаццаць брамаў — з дванаццаці пэрлінаў, кожная брама — з аднае пэрліны. І вуліца
гораду — з чыстага золата, празрыстага, як шкло.
22 І бажніцы ў ім ня ўбачыў я, бо Госпад, Бог Усеўладны, і Ягня — гэта бажніца ягоная.
23 І горад ня мае патрэбы ані ў сонцы, ані ў месяцы, каб асьвятлялі яго, бо слава Божая
асьвяціла яго, і сьветач ягоны — Ягня.
24 І народы збаўленых будуць хадзіць у сьвятле ягоным, і валадары зямныя прынясуць у яго
славу і гонар свае.
25 І брамы ягоныя ня будуць замыкацца ўдзень, а ночы там ня будзе.
26 І прынясуць у яго славу і гонар народаў.

27 І ня ўвойдзе ў яго ніхто апаганены і той, хто чыніць агіду і хлусьню, а толькі запісаныя ў
кнізе жыцьця Ягняці.

Адкр 22

1 І паказаў ён мне чыстую раку вады жыцьця, сьветлую, як крышталь, якая выходзіла з пасаду
Бога і Ягняці.
2 На сярэдзіне вуліцы яго і паабапал ракі — дрэва жыцьця, якое дае плады дванаццаць разоў,
даючы на кожны месяц ягоны плод; і лісьце дрэва — дзеля аздараўленьня народаў.
3 І ня будзе ўжо нічога выклятага. І пасад Бога і Ягняці будзе ў ім, і слугі Ягоныя будуць
служыць Яму.
4 І яны ўгледзяць аблічча Ягонае, і імя Ягонае — на ілбах іхніх.
5 І ночы ня будзе там, і ня будуць мець патрэбы ў сьветачы і ў сьвятле сонца, бо Госпад Бог
асьвятляе іх, і будуць валадарыць на вякі вякоў.
6 І сказаў мне: «Словы гэтыя верныя і праўдзівыя. І Госпад, Бог сьвятых прарокаў, паслаў анёла
Свайго паказаць слугам Сваім, што мусіць стацца неўзабаве.
7 Вось, прыходжу хутка. Шчасьлівы той, які захоўвае словы прароцтва кнігі гэтае».
8 І я, Ян, бачыў гэта і чуў. І калі я пачуў і ўбачыў, я ўпаў пакланіцца перад нагамі анёла, які
паказваў мне гэта.
9 І ён кажа мне: «Глядзі, не [рабі гэтага], бо я — таварыш твой і братоў тваіх, прарокаў, і тых,
якія захоўваюць словы кнігі гэтае. Богу пакланіся».
10 І кажа мне: «Не запячатывай словы прароцтва кнігі гэтае, бо час блізкі.
11 Крыўдзіцель няхай яшчэ робіць крыўду, і брудны няхай яшчэ брудзіцца, і праведны няхай
яшчэ чыніць праведнасьць, і сьвяты няхай яшчэ асьвячаецца.
12 І вось, Я прыходжу хутка, і нагарода Мая са Мною, каб аддаць кожнаму [паводле таго], якія
будуць справы ягоныя.
13 Я — Альфа і Амэга, Пачатак і Канец, Першы і Апошні.
14 Шчасьлівыя тыя, якія выконваюць прыказаньні Ягоныя, каб была ўлада ў іх на дрэва жыцьця,
і каб увайсьці праз брамы ў горад.
15 А звонку — сабакі і чараўнікі, і распусьнікі, і забойцы, і ідалапаклоньнікі, і ўсе, якія любяць
і чыняць падман.
16 Я, Ісус, паслаў анёла Майго засьведчыць вам гэта ў цэрквах. Я — корань і род Давіда, зорка
сьветлая і ранішняя».
17 І Дух, і нявеста кажуць: «Прыйдзі!» І хто чуе, няхай скажа: «Прыйдзі!» І той, хто смагне,
няхай прыходзіць, і той, хто хоча, няхай бярэ ваду жыцьця дарма.
18 Бо я сьведчу кожнаму, хто чуе словы прароцтва кнігі гэтае: калі хто дакладзе [нешта] да
гэтага, Бог ускладзе на яго плягі, напісаныя ў кнізе гэтай;
19 і калі хто забярэ нешта ад словаў кнігі прароцтва гэтага, Бог забярэ ў яго частку ягоную з
кнігі жыцьця, і з гораду сьвятога, і з таго, што напісанае ў кнізе гэтай.
20 Той, Які засьведчыў гэта, кажа: «Так, прыходжу хутка!» Амэн. Так, прыйдзі, Госпадзе Ісусе!
21 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з усімі вамі. Амэн.